БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ў 18 ТАМАХ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ТОМ 14

РЭЛЕ
СЛАЯВІНА

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г.П.ПАШКОЎ (галоўны рэдактар), **В.С.АНОШКА, І.І.АНТАНОВІЧ, В.С.АНТАНЮК, Я.М.БАБОСАЎ, В.К.БАНДАРЧЫК, М.А.БАРЫСЕВІЧ, В.І.БОЎШ, Т.Я.БУРАКОВА** (намеснік галоўнага рэдактара), **А.П.ВАЙТОВІЧ, І.Дз.ВАЛАТОЎСКІ, М.С.ВЫСОЦКІ, І.В.ГАЙШУН, А.М.ГАНЧАРЭНКА, Р.Г.ГАРЭЦКІ, В.М.ГУРЫН, А.М.ДАНІЛАЎ, У.П.ЗАМЯТАЛІН, В.В.ЗУЁНАК, М.П.КАСЦЮК, У.Р.ЛАТЫПАЎ, С.С.ЛАЎШУК, І.М.ЛУЧАНОК, Г.М.ЛЫЧ, А.В.МАЦВЕЕЎ, А.М.МІХАЛЬЧАНКА, І.Я.НАВУМЕНКА, У.М.НІЧЫПАРОВІЧ, М.В.ПАДГАЙНЫ, А.І.ПАДЛУЖНЫ, Ю.В.ПАРТНОЎ, П.Ц.ПЕТРЫКАЎ, М.Ф.ПІЛІПЕНКА, У.В.РУСАКЕВІЧ, А.В.САБАЛЕЎСКІ, М.А.САВІЦКІ, С.П.САМУЭЛЬ, А.Г.СЛУКА, М.С.СТАШКЕВІЧ, М.В.СТОРАЖАЎ, В.І.СТРАЖАЎ, Л.М.СУШЧЭНЯ, Г.А.ФАТЫХАВА** (намеснік галоўнага рэдактара), **А.К.ФЯДОСАЎ** (намеснік галоўнага рэдактара — адказны сакратар), **І.П.ХАЎРАТОВІЧ, І.П.ШАМЯКІН, В.П.ШАРАНГОВІЧ.**

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
2002

УДК 03(476)
ББК 92(4Беи)
Б 43

НАВУКОВА-РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ:

А.М.АБРАМОВІЧ, У.І.АДАМУШКА, А.І.АКСЁНЕНКА, Я.Я.АЛЯКСЕЙЧЫК, М.М.АЛЯХНОВІЧ, І.П.АНТОНАЎ, П.А.АПАНАСЕВІЧ, І.В.АРЖАХОЎСКІ, Г.С.АЎСЯННІКАЎ, Ю.В.БАЖЭНАЎ, М.Р.БАРАЗНА, У.С.БАСАЛЫГА, В.І.БЕРНІК, А.А.БОГУШ, А.І.БОЛСУН, Ю.П.БРОЎКА, П.І.БРЫГАДЗІН, В.С.БУРАКОЎ, У.К.ВАРАБ'ЁЎ, У.П.ВЯЛІЧКА, У.С.ГЛУШАКОЎ, С.І.ГРЫБ, А.П.ГРЫЦКЕВІЧ, А.П.ДАСТАНКА, М.І.ДЗЯМЧУК, С.Ф.ДУБЯНЕЦКІ, Р.А.ЖМОЙДЗЯК, В.П.ЖУРАЎЛЁЎ, Э.М.ЗАГАРУЛЬСКІ, М.Е.ЗАЯЦ, М.А.ІЗОБАЎ, У.В.КАВАЛЁНАК, Л.В.КАЛЕНДА, Я.Ф.КАНАПЛЯ, Ф.М.КАПУЦКІ, Л.В.КІРЫЛЕНКА, В.П.КІСЕЛЬ, П.І.КЛІМУК, У.М.КОНАН, У.С.КОШАЛЕЎ, А.В.КРАСІНСКІ, Б.А.ЛАЗУКА, І.І.ЛЕАНОВІЧ, А.І.ЛЕСНІКОВІЧ, А.С.ЛІС, А.М.ЛІТВІН, І.І.ЛІШТВАН, У.Ф.ЛОГІНАЎ, Р.Ч.ЛЯНЬКЕВІЧ, З.Я.МАЖЭЙКА, М.А.МАЙЕР, А.С.МАЙХРОВІЧ, А.В.МАЛЬДЗІС, Л.Я.МІНЬКО, А.Я.МІХНЕВІЧ, У.М.МІХНЮК, М.В.НІКАЛАЕЎ, П.Г.НІКІЦЕНКА, С.А.НІЧЫПАРОВІЧ, В.І.ПАРФЁНАЎ, М.М.ПІКУЛІК, У.А.ПІЛІПОВІЧ, Л.Д.ПОБАЛЬ, І.М.ПТАШНІКАЎ, П.І.РОГАЧ, Л.М.РОЖЫНА, А.У.РУСЕЦКІ, А.І.РУЦКІ, В.В.СВІРЫДАЎ, С.А.СЕРГАЧОЎ, І.Д.СІПАКОЎ, С.У.СКАРУЛІС, Э.М.СКОБЕЛЕЎ, Р.Б.СМОЛЬСКІ, В.С.ТАНАЕЎ, У.М.ТАНАНА, А.А.ТОЗІК, У.С.УЛАШЧЫК, А.А.ФІЛІМОНАЎ, В.А.ФЯДОСІК, Л.У.ХАТЫЛЁВА, В.С.ЦІТОЎ, А.Р.ЦЫГАНАЎ, Ю.М.ЧУРКО, В.У.ЧЭЧАТ, І.В.ШАБЛОЎСКАЯ, В.Ф.ШМАТАЎ, А.Р.ШРУБЕКА, Г.В.ШТЫХАЎ, У.А.ШЧАРБАКОЎ, Дз.І.ШЫРАКАНАЎ, Л.У.ЯЗЫКОВІЧ, У.У.ЯЗЭПЧЫК.

НАВУКОВЫЯ КАНСУЛЬТАНТЫ:

М.Э.АБАЛА (Латвія), **С.М.АБРАМАЎ, А.А.АБРАМЧУК, Т.І.АДУЛА, Р.М.АЛАДАВА, В.А.АНТАНЕВІЧ, А.Ц.БАЖКО, Л.А.БАЛВАНОВІЧ, Я.І.БАРАНОЎСКІ, А.А.БАРШЧЭЎСКІ** (Польшча), **Л.П.БАРШЧЭЎСКІ, С.І.БЕЛЬСКАЯ, І.В.БОДНАР, А.М.БУЛЫКА, А.І.БУТЭВІЧ, М.С.ВАЙТОВІЧ, Г.В.ВАЛАБУЕВА, З.А.ВАЛЕВАЧ, Э.А.ВАЛЬЧУК, А.А.ГАЛАЎКО, А.І.ГАЛАЎНЁЎ, С.В.ГОВІН, Л.І.ГУРСКІ, А.А.ГУСАК, Б.Дз.ДАЛГАТОВІЧ, Л.Н.ДРОБАЎ, М.А.ДУБІЦКІ, І.У.ДУДА, А.М.ЕЛСУКОЎ, А.І.ЕРАШОЎ, А.І.ЖУРАЎСКІ, У.Р.ЗАЛАТАГОРАЎ, Р.Г.ЗАЯЦ, Э.Р.ІОФЕ, У.Ф.ІСАЕНКА, Л.Р.КАЗЛОЎ, Л.В.КАЗЛОЎСКАЯ, В.М.КАНДРАЦЬЕЎ, Р.КАРЭЦКАС** (Літва), **М.М.КАСЦЮКОВІЧ, І.В.КАТЛЯРОЎ, У.У.КОЖУХ, У.К.КОРШУК, Г.Р.КУЛЯШОВА, У.Ф.ЛАДЫСЕЎ, А.А.ЛАЗАРЭВІЧ, І.Л.ЛАПІН, А.П.ЛАПІНСКЕНЕ** (Літва), **У.С.ЛАРЫЁНАЎ, А.П.ЛАСКАЎНЁЎ, М.В.ЛАЎРЫНОВІЧ, А.С.ЛЕАНЦЮК, У.І.ЛЕМЯШОНАК, Е.А.ЛЯВОНАВА, К.Л.МАЙСЯЙЧУК, С.Дз.МАЛЮКОВІЧ, В.Дз.МАРОЗАЎ, Л.М.МАРЧАНКА, Я.Г.МІЛЯШКЕВІЧ, Т.М.МІХЕЕВА, Л.І.НАВУМЕНКА, В.М.НАВУМЧЫК, А.І.НАРКЕВІЧ, В.Л.НАСЕВІЧ, М.М.ПАГРАНОЎСКІ, М.Р.ПРАКАПЧУК, В.М.ПРОХАРАЎ, П.А.ПУПКЕВІЧ, В.П.РАГОЙША, В.У.РАДЗІВІНОЎСКІ, Л.М.РАЖАНАВА, Г.В.РАТНІКАЎ, А.РАЧЫС** (Літва), **Г.Ф.РЫКОЎСКІ, М.П.САВІК, У.Л.САКАЛОЎСКІ, Л.Ф.САЛАВЕЙ, Э.Р.САМУСЕНКА, С.Н.САРЫНЯН** (Арменія), **Я.М.САХУТА, І.С.САЦУНКЕВІЧ, В.Дз.СЕЛЯМЕНЕЎ, У.М.СЕЎРУК, Г.В.СІНІЛА, І.І.СІНЧУК, В.П.СЛАВУК, У.Е.СНАПКОЎСКІ, М.Ф.СПІРЫДОНАЎ, Г.Г.СЯРГЕЕВА, А.П.ТКАЧЭНКА, В.Ф.ЦАРОВА** (Латвія), **А.А.ЦІТАВЕЦ, Г.А.ЦЫХУН, В.А.ЧАБАНЕНКА** (Украіна), **А.А.ЧАЛЯДЗІНСКІ, В.М.ЧАРНАТАЎ, І.А.ЧАРОТА, Г.Г.ШАНЬКО, А.В.ШАРАПА, Л.П.ШАХОЦЬКА, С.Л.ШМАТОК, Я.Ф.ШУНЕЙКА, Г.У.ШУР, А.П.ШЧУРАЎ, А.А.ШЫМБАЛЁЎ, М.Р.ЮРКЕВІЧ, М.З.ЯГОЎДЗІК, В.І.ЯКАЎЧУК.**

Мастацкае афармленне **Э.Э.ЖАКЕВІЧА, А.М.ХІЛЬКЕВІЧА**

ISBN 985-11-0238-5 (т. 14)
ISBN 985-11-0035-8

© Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя»
імя Петруся Броўкі, 2002

Р

РЭЛЕ́ (ад франц. relais ад relaer змяніць, замяніць), прылада для аўтаматычнай *камутацыі* эл. ланцугоў па зададзеным вонкавым уздзеянні (па сігнале). Складаецца з рэлейнага элемента, які мае 2 станы ўстойлівай раўнавагі, і групы эл. кантактаў, што замыкаюцца або размыкаюцца пры змене стану рэлейнага элемента. Выкарыстоўваецца ў *рэлейнай ахове* эл. сетак і электраўстановак, ва ўстройствах аўтам. кіравання, кантролю, сігналізацыі і інш.

Рэлейны элемент змяняе свае станы раўнавагі пад уздзеяннем эл. ці неэл. велічынь. Для ўспрымання неэл. велічынь выкарыстоўваюцца разнастайныя *вымяральныя пераўтваральнікі*. Адрозніваюць Р.: эл. (рэагуюць на сілу току, напружанне, частату эл. ваганняў), магн. (на напружанасць магн. току, магн. індукцыю і інш.), мех. (на перамяшчэнне, скорасць, ціск, амплітуду ваганняў і інш.), цеплавыя (на т-ру, цеплавы паток), акустычныя (на частату гукавых ваганняў, акустычны ціск), аптычныя (на асветленасць, светлавы паток, частату светлавых ваганняў). Найб. пашыраны: эл.-магн. Р., у якіх пры пэўнай велічыні току ў абмотцы якар прыцягваецца да асяродка і замыкае (ці размыкае) кантакты ў кіроўным ланцугу; *рэле часу* (Р. вытрымкі), якое стварае неабходную затрымку ў перадачы ўздзеяння на выканаўчы механізм. Напр., у электратэрмамех. Р. часу пры награваннi токам біметал. пласціны яна дэфармуецца і замыкае кантакты. *У.М.Сацута.*

РЭЛЕ́ ЧА́СУ, прыстасаванне (прылада), кантакты якога замыкаюцца або размыкаюцца з некаторай затрымкай у часе пасля атрымання кіроўнага сігналу. Затрымку рэгулююць адвольна, для чаго выкарыстоўваюць розныя яе схемы.

У эл. Р.ч. такая схема заснавана на замаруджванні нарастання або спадання сілы току (велічыні напружання) у эл. ланцугах, якія маюць кандэнсатары, шпулі індуктыўнасці, рэзістары, лічыльнікі імпульсаў. У цеплавых Р.ч. выкарыстоўваюць дэфармацыю біметал. пласцін пры награваннi токам, у пнеўматычным — змену скорасці выцякання газу (паветра) з рэзервуара. Час затрымкі Р.ч. ад некалькіх мікрасекунд да некалькіх гадзін. Выкарыстоўваюцца ў *рэлейнай ахове*, сістэмах аўтаматыкі, пры фотадрукаванні і інш.



Рэле: а — электрамагнітнае (1 — кантактныя спружыны, 2 — кантакты, 3 — якар, 4 — асяродак, 5 — абмотка); б — механічнае паплаўковае ўзроўню вадкасці (1 — рэгулявальная гайка, 2 — шток, 3 — паплавок, K — кантакты); в — цеплавое (1 і 2 — трубка і стрыжань з матэрыялаў з рознымі тэмпературнымі каэфіцыентамі расшырэння, 3 — кантакты, 4 — рычаг, 5 — рэгулявальны вінт); г — біметалічныя рэле часу з тэмпературнай кампенсацыяй (1 — біметалічныя пласцінкі, 2 — награвальнік).

РЭ́ЛЕЙ, Р э й л і (Rayleigh) Джон Уільям (12.11.1842, каля г. Малдан, Вялікабрытанія — 30.6.1919), англійскі фізік, адзін са стваральнікаў тэорыі ваганняў. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1873). Прозвішча да атрымання тытула лорда Рэлея (1873) — С т р э т (Strutt). Скончыў Кембрыджскі ун-т (1865), дзе і працаваў да 1871. У 1879—84 дырэктар *Кавендышскай лабараторыі*. У 1905—08 прэзідэнт Лонданскага каралеўскага т-ва. Навук. працы па акустыцы, оптыцы, гідрадынаміцы, электрамагнетызме і інш. Даследаваў дыфракцыю, рассеянне і паглынанне мех. хваль, устанавіў сувязь паміж фазавай і групавой скорасцю хваль. Заклаў асновы малекулярнага рассеяння святла (гл. *Рэлея закон*), вывеў адзін з законаў выпрамянення (гл. *Рэлея—Джынса закон выпрамянення*), устанавіў закон намагнічвання цел (гл. *Рэлея закон намагнічвання*). Стварыў тэорыю *раздзяляльнай здольнасці* аптычных прылад. Адкрыў (з У.*Рамзаем*) хім. элемент — аргон. Сканструяваў і вынайшаў шэраг фіз. прылад (дыск Р., манометр Р., рэфрактометр Р. і інш.). Нобелеўская прэмія 1904.

Тв.: Рус. пер. — Волновая теория света. М.; Л., 1940; Теория звука. Т. 1—2. 2 изд. М., 1955.

Літ.: Л ь о ц ц и М. История физики: Пер. с итал. М., 1970.

Дж.Рэлей.

РЭЛЕ́ЙНАЯ АХО́ВА, сукупнасць аўтам. прыстасаванняў (аднаго ці некалькіх *рэле*), што ахоўваюць эл. абсталяванне, установкі, сістэмы ад пашкоджанняў ці ненармальных (аварыйных) рэжымаў. Прылады Р.а. ўспрымаюць інфармацыю пра рэжым работы ахоўнага аб'екта, выпрацоўваюць і падаюць каманды на адключэнне выключальнікаў (пры *ка-*

роткіх замыканнях, *перанапружаннях*, перагрузках і інш.), уключэнне светлавога або гукавога сігналу.

Асобнымі прыстасаваннямі Р.а. абсталёваюць кожны элемент эл. сістэмы — генератары, трансфарматары, лініі электраперадач і інш. Адрозніваюць Р.а.: асноўную і рэзервовую (дзейнічае пры адказе асн.), токавую (дзейнічае, калі сіла току ў ахоўным ланцугу перавышае зададзенае значэнне), дыстанцыйную (спрацоўвае ў залежнасці ад адлегласці — дыстанцыі да месца кароткага замыкання, што забяспечвае селектыўнае адключэнне пашкоджанага ўчастка ЛЭП), дыферэнцыяльную (рэагуе на рознасць токаў па канцах ахоўнага ўчастка эл. сістэмы, дзе ўстанаўліваюцца *трансфарматары вымяральныя*), высокачастотную (выкарыстоўвае токі высокай частаты для атрымання інфармацыі з выхаду аб'екта). Найб. пашырана максімальная токавая ахова. У Р.а. шырока выкарыстоўваюцца *бескантактавая камутацыйная апаратура*, аўтам. *пераключальнікі*.

Літ.: Чернобровов Н.В. Релейная защита. 4 изд. М., 1971; Федосеев А.М. Релейная защита электрических систем. М., 1976.

У.М.Сацута.



Схема максімальнай токавай **рэлейнай аховы** 3-фазнай ЛЭП ад міжфазных кароткіх замыканняў: 1 — шыны падстанцыі, ад якіх адыходзіць ЛЭП; 2 — высакавольтны выключальнік; 3 — трансфарматары току; Т, Ч, Пр, Пк — рэле токавыя, частаты, прамежкавае, паказальнае.

РЭ́ЛЕС Рыгор Львовіч (н. 23.4.1913, г. Чашнікі Віцебскай вобл.), яўрэйскі і рус. пісьменнік. Скончыў Віцебскі пед. тэхнікум (1933), Мінскі пед. ін-т (1937). Працаваў у школах Слуцка, Навагрудка і Мінска, у газ. «Заря» (Брэст), «Зорька», час. «Вожык». Друкуецца з 1931. Піша на яўр. і рус. мовах. Аўтар. зб-каў вершаў «Пачатак» (1939), «Вершы» (1941), «Водгукі часу» (1974), аповесцей і апавяд. «Сябры і знаёмыя» (1963), «У родным кутку» (1972), «Праз цяжкі парог» (1976), «Пад ясным небам», «Не ружамі ўсланы твой шлях» (абодва 1983), «У краі светлых бяроз» (1997) і інш. У перакладзе на бел. мову выйшлі кнігі нарысаў і апавяд. «Запіскі майго калегі» (1960), вершаў «Бяроза пад акном» (1961), «З тых жа крыніц» (1993), «Аднаактовыя п'есы» (1964, з Х.Мальцінскім). На бел. мову яго вершы перакладалі Р.Барадулін, Ф.Баторын, А.Зарыцкі, апавяданні і п'есы — М.Татур.

РЭ́ЛЕЯ ЗАКО́Н рассеяння святла. Вызначае характар пругкага *рассеяння святла* ў асяроддзі, памеры неаднароднасцей якога значна меншыя за *даўжыню хвалі* святла. Паводле Р.з. інтэнсіўнасць пругкага рассеяння святла прапарцыянальная $1/\lambda^4$, дзе λ — даўжыня хвалі святла. З Р.з. вынікае, што блакітныя і фіялетавыя прамяні рассейваюцца мацней, чым чырвоныя, што тлумачыць блакітны колер неба. Устаноўлены Дж.У.*Рэлеем* (1871).

РЭ́ЛЕЯ ЗАКО́Н НАМАГНІ́ЧВАННЯ, залежнасць *намагнічанасці* ферамагнетыка ад напружанасці знешняга магн. поля ў слабых палях, калі напружанасць поля, што дзейнічае на цела, многа меншая за *каэрцытыўную сілу*. Устаноўлены Дж.У.*Рэлеем* (1887). Для крывой пачатковага намагнічвання выражаецца формулай $J=\chi_{аб} \cdot H \pm RH^2$, дзе J — намагнічанасць; H — напружанасць знешняга магн. поля; $\chi_{аб}$ — абарачальная *магнітная ўспрымлівасць*, якая характарызуе абарачальную лінейную частку працэсу; R — пастаянная Рэлея, якая характарызуе неабарачальныя нелінейныя працэсы намагнічвання (неабарачальныя зрушэнні даменных межаў); знак «+» адпавядае $H>0$, знак «–» $H<0$. Неабходная ўмова для выканання закону — павольная, квазістатычная змена магн. поля для звядзення да мінімуму эфектаў, абумоўленых магн. паслядзеяннем (гл. *Магнітная вязкасць*).

РЭ́ЛЕЯ — ДЖЫ́НСА ЗАКО́Н ВЫПРАМЯНЕ́ННЯ, закон размеркавання энергіі ў спектры абсалютна чорнага цела ў залежнасці ад т-ры. Тэарэтычна выведзены Дж.У.*Рэлеем* (1900) на падставе класічных уяўленняў аб раўнамерным размеркаванні энергіі па ступенях свабоды і незалежна ад яго Дж.*Х.Джынсам* (1905—09) метадамі статыстычнай механікі. Паводле закону шчыльнасць энергіі выпрамянення $u_\nu = \frac{8\pi\nu^2}{C^3} kT$, дзе ν — частата выпрамянення, c — скорасць святла ў вакууме, k — *Больцмана пастаянная*, T — абс. т-ра. Гэты закон — гранічны выпадак *Планка закону выпрамянення* для малых частот (вял. даўжынь хваль).

РЭЛІГІ́ЙНЫЯ ВО́ЙНЫ, войны, якія адбываюцца ў адпаведнасці з прадпісаннямі рэлігійных догматаў або пад патранажам царквы (рэліг. арганізацыі), напр. *крыжовыя паходы*, у т.л. супраць славян і балтаў у 12—15 ст. і інш. Гл. таксама *Джыхад*. У еўрап. гістарыяграфіі Р.в. звычайна называюць *Гугеноцкія войны* ў Францыі, грамадзянскія войны паміж католікамі і пратэстантамі (*гугенотамі*) у 2-й пал. 16 ст., абумоўленыя комплексам рэліг., сац. і паліт. супярэчнасцей. Каталіцкую партыю на чале з Гізамі падтрымлівалі паўн.-ўсх. і цэнтр. правінцыі Францыі. Кальвіністаў (гугенотаў), якіх у розныя часы ўзначальвалі прынц Кандэ, адмірал Каліны, Генрых Наварскі, падтрымлівалі гарады і дваранства зах. і паўд. правінцый краіны. Зачэпкай для 1-й Р.в. (сак. 1562— сак. 1563) было забойства пратэстантаў у сак. 1562 атрадам Ф. дэ Гіза каля мяст. Васі ў Шампані. У адказ пратэстанты на чале з Кандэ сабралі войска і захапілі шэраг гарадоў. У першай бітве (снеж. 1562 каля Дро) перамаглі католікі. У гэтай і наступных бітвах на баку пратэстантаў выступалі ням., а на баку католікаў — італьян. наёмнікі. Пасля забойства Гіза (1563) на чале каталіцкай партыі сталі яго сыны Генрых, Луі (кардынал Латарынгскі) і Шарль. Вайна завяршылася прыняццем эдыкта (15.3.1563, у Амбуазе), які дазволіў пратэстанцкі культ. 2-я Р.в. (вер. 1567 — сак. 1568) пачалася з «сюрпрызу ў Мо», калі Кандэ спрабаваў захапіць караля. Ваен. дзеянні вяліся вакол Парыжа. У бітве пры Сен-Дэні гугеноты пацярпелі паражэнне і ў Ланжумо быў заключаны мір. 3-я Р.в. (жн. 1568 — жн. 1570) вялася на З і Пд краіны, дзе брат караля Генрых Анжуйскі ваяваў супраць Кандэ і Каліны. Найб. крывавыя бітвы адбыліся пры Жарнаку (сак. 1569), калі загінуў Кандэ, і пры Манкантуры (кастр. 1569), калі гугеноты пацярпелі паражэнне. Аднак паводле міру ў Сен-Жэрмене (1570) пратэстанты атрымалі свабоду веравызнання і 4 гарады-крэпасці ў якасці гарантый іх бяспекі. Шлюб паміж Генрыхам Наварскім і сястрой караля Маргарытай Валуа 18.8.1572 павінен быў замацаваць дасягнуты мір. Аднак масавае забойства гугенотаў 24.8.1572 (гл. *Варфаламееўская ноч*), калі загінула каля 3 тыс. чал., у т.л. адмірал Каліны, прывяло да 4-й Р.в. (жн. 1572 — ліп. 1573) і эскалацыі насілля з абодвух бакоў. Пасля няўдалай аблогі ўрадавымі войскамі Ла-Рашэлі быў заключаны мір. Булонскі эдыкт (1573) пацвердзіў свабоду веравызнання. Характэрнай рысай 5-й Р.в. (ліст. 1574 — май 1576) быў саюз паміж памяркоўнай ч. католікаў, т.зв. «палітыкаў», якіх узначальваў брат караля Францыск Алансонскі, і пратэстантамі. Паводле міру ў Бальё (1576) урад рэабілітаваў гугенотаў, забітых у час Варфаламееўскай ночы і пацвердзіў свабоду веравызнання. Да гэтага часу склалася паліт. арганізацыя гугенотаў, якая аб'яднала гугеноцкія гарады З і Пд краіны ў пратэстанцкую канфедэрацыю, фактычна незалежную ад цэнтр. ўрада. У адказ у Пероне аформілася *Каталіцкая ліга 1576*. На Генеральных штатах у Блуа (1576) пад націскам каталіцкай партыі кароль 1.1.1577 адмовіўся ад эдыкта ў Бальё і абвясціў каталіцызм адзінай рэлігіяй у дзяржаве, што прывяло да 6-й Р.в. (снеж. 1576—кастр. 1577). Аднак адсутнасць фін. сродкаў прымусіла абодва бакі падпісаць мір 17.9.1577 у Бержэраку і эдыкт у Пуацье (кастр. 1577), які ў асн. паўтараў эдыкт у Бальё. 7-я Р.в. (ліст. 1579 — ліст. 1580) была выклікана барацьбой гугенотаў за выкананне артыкулаў эдыкта ў Пуацье і вяртанне гарадоў-крэпасцей, якія гарантавалі іх бяспеку. Апошняя Р.в. (ліп. 1585—чэрв. 1598), або т.зв. «вайна Ліг».

пачалася пасля смерці 10.6.1584 Францыа Алансонскага і прызнання Генрыха Наварскага спадкаемцам трона. Адноўленая Каталіцкая ліга вымусіла караля Генрыха III Немурскім эдыктам (ліп. 1585) забараніць пратэстанцкае веравызнанне ў краіне. Пашырэнне ўплыву Каталіцкай і далучанай да яе Парыжскай лігі, прэтэнзіі Г. дэ Гіза на трон прывялі да забойства апошняга і яго брата, кардынала Латарынгскага (снеж. 1588), заключэння саюза паміж Генрыхам III і Генрыхам Наварскім і аблогі іх войскамі Парыжа. У час гэтай аблогі 1.8.1589 Генрых III забіты і трон перайшоў да Генрыха Наварскага, які 25.7.1593 прыняў каталіцтва і 27.2.1594 каранаваўся ў Шартры як Генрых IV. У сак. 1594 Парыж адчыніў яму свае вароты, а да 1596 было задушана супраціўленне праціўнікаў Генрыха IV ва ўсёй Францыі. На апошнім этапе ў 1595—98 адбылася вайна паміж Францыяй і Іспаніяй, якая скончылася мірам у Вервене (май 1598) і канчатковым прызнаннем правоў Генрыха IV. Паводле *Нанцкага эдыкта 1598* франц. пратэстанты атрымалі свабоду веравызнання і гарантыі іх бяспекі.

Літ.: Баблон Ж.-П. Генрих IV: Пер. с фр. Ростов н/Д, 1999. *Дз.М.Чаркасаў.*

РЭЛІГІЯ (ад лац. religio набожнасць, святыня, прадмет культу), сістэма тэалагічных дактрын, уяўленняў, культавых рэчаў і дзеянняў, а таксама арг-цый, накіраваная на абгрунтаванне існавання Бога або наогул звышнатуральнага пачатку. Існуе шмат падыходаў у вырашэнні пытанняў сутнасці і генезісу Р. Прадстаўнікі этналагічнага кірунку (Э.Тайлар, Дж.Дж.Фрэйзер, К.Леві-Строс) узнікненне Р. ставілі ў залежнасць ад прымітыўнага ўзроўню вытв-сці і духоўнай культуры. Марксізм лічыў Р. адлюстраваннем у свядомасці чалавека з'яў навакольнага свету. Псіхалагічныя канцэпцыі паходжання Р. трактуюць яе як выяўленне асобных станаў псіхікі чалавека (У.Джэмс, З.Фрэйд, К.Г.Юнг, Л.Леві-Бруль). П.А.Флярэнскі, Г.Лейв, Р.Ота вызначалі сутнасць Р. як агульначалавечае імкненне да свяшчэннага, трансцэндэнтнага аб'екта. Сац. змест Р. грунтуецца на пэўнай сістэме каштоўнасцей (этнічных, паліт., бытавых), якой надаецца эталонны статус, замацаваны аўтарытэтам Бога. Сярод асн. функцый Р. і н т э г р а ц ы й н а я (аб'яднанне няўстойлівых сац. суполак на аснове рэліг. ідэалогіі) і в ы х а в а ў ч а я (перадача з пакалення ў пакаленне ведаў, духоўных каштоўнасцей, жыццёвага вопыту і інш.). Гал. элементам Р. з'яўляецца ідэалогія (*веравызнанне*), якая складаецца з комплексу догматаў і дактрын і канцэнтруе ў сабе сац. вопыт. Веравызнанне вызначае належнасць этнасу да пэўнай цывілізацыі (М.Я.Данілеўскі, О.Шпенглер, Э.Хантынгтан). Т.ч., Р. выступае не толькі модусам этнаўтварэння, але і дамінантай духоўнай культуры. Значнае месца ў Р. займае *культ рэлігійны*, дзякуючы якому ў грамадстве ўзнаўляюцца і захоўваюцца пазітыўныя традыцыі. Рэліг. арг-цыі складаюць такія ін-ты, як *царква*, *секта*, дэнамінацыя (рэліг. арг-цыя ў стадыі станаўлення), а таксама рэліг. суполкі (брацтвы, місіі, цэнтры і інш.). Р. з'яўляецца ч. натуральна-гіст. эвалюцыі грамадства, і таму спробы вывесці яе па-за межы сац. працэсу (як, напр., у СССР) адбываліся ў адм., прымусовай і нават гвалтоўнай формах. Найб. раннімі выяўленнямі Р. былі *магія*, *татэмізм*, *анімізм* і інш. Для стараж. Р. характэрны політэізм (многабожжа), які змяніўся *монатэізмам* (адзінабожжам). Вылучаюць розныя гіст. формы і тыпы Р.: родава-пляменныя (*язычніцтва*); нац.-дзярж., ці этнічныя, прыхільнікамі якіх з'яўляюцца прадстаўнікі адной нацыянальнасці (*даасізм*, *індуізм*, *іудаізм*, *сінтаізм* і інш.); сусветныя, якія набылі наднац. характар і атрымалі паўсюднае пашырэнне (*будызм*, *хрысціянства*, *іслам*). Апошнім часам у свеце набывае дынаміку працэс стварэння адзінай глабальнай Р. ў межах экуменічнага руху на аснове ідэй і прынцыпаў розных Р. (гл. *Экуменізм*).

На Беларусі ў стараж. перыяд рэліг. вераванні існавалі ў форме язычніцтва. У канцы 10—пач. 11 ст. дзярж. рэлігіяй на бел. землях стала хрысціянства ва ўсх. форме (з 1054 праваслаўе), а пасля Крэўскай уніі 1385 і каталіцызм (гл. *Беларуская праваслаўная царква*, *Рымска-каталіцкая царква* на Беларусі). З 14—15 ст. са з'яўленнем у ВКЛ татар і яўрэяў на Беларусі пашырыліся іслам і іудаізм. У 16 ст. ўзнік *пратэстантызм* і яго кірункі — *кальвінізм*, *лютэранства*, *арыянства* і інш. З 1569 дзейнічала уніяцкая царква (гл. *Беларуская грэка-каталіцкая царква*). На 1.1.2001 на Беларусі дзейнічае 26 канфесій (2663 абшчыны), у т.л. 1172 правасл. абшчыны, 417 рымска-каталіцкіх, 13 грэка-каталіцкіх, 34 старавераднікія, 470 хрысціян веры евангельскай, 268 — евангельскіх хрысціян-баптыстаў, 22 — іудаістаў, 24 абшчыны мусульман і інш.

Літ.: Никольский Н.М. Избранные произведения по истории религии. М., 1974; Фрэйзер Дж.Дж. Золотая ветвь: Пер. с англ. 2 изд. М., 1986; Иллюстрированная история религий. Т. 1—2. 2 изд. М., 1992; Митрохин Л.Н. Философия религии. М., 1993; Религиозные традиции мира: Пер. с англ. [Т. 1—2]. М., 1996; Росс Ф., Хиллс Т. Великие религии человечества: Пер. с англ. М; Ростов н/Д, 1999. *А.А.Цітавец.*

РЭЛІКВІІ ц а р к о ў н ы я, прадметы рэліг. пакланення, якія звязваюцца з жыццём Хрыста, Багародзіцы ці святых. Да Р. адносяць таксама *мошчы*. Ушанаванне Р. узыходзіць да першабытных вераванняў (гл. *Фетышызм*). Царквой Р. прыпісваецца цудадзейная сіла (вылячэнне і інш.). Найб. культ Р. распаўсюджаны ў каталіцызме. У каталіцкіх храмах і кляштарах захоўваюць рэшткі адзення Хрыста, кавалачкі «крыжа, на якім ён быў распяты», цвікі, «якімі яго прыбівалі да крыжа», і інш. Храмы і кляштары, якія валодаюць Р., асабліва ўшаноўваюцца і прыцягваюць шматлікіх паломнікаў.

РЭЛІКВІЯ (ад лац. reliquiae рэшткі, астанкі), 1) у розных рэлігіях асабліва шанаваныя прадметы, якія нібыта належалі багам, прарокам, ці астанкі святых (мошчы). Р. часам прыпісваецца цудадзейная сіла, здольная вылечваць хваробы. 2) Прадмет, які беражліва захоўваецца як памяць пра мінулае. Напр., Р. ваен.-гіст. (баявыя сцягі, асабістая і калект. зброя, узнагароды, рэчы, дакументы, фотаздымкі і інш.) сведчаць пра ваенна-гіст. падзеі, славутых дзеячаў. Р. сямейныя (дакументы, прадметы, якія належаць сям'і, роду) перадаюцца ў спадчыну з пакалення ў пакаленне.

РЭЛІКТАВАЕ ВЫПРАМЯНЁННЕ, касмічнае эл.-магн. выпрамяненне, спектральныя характарыстыкі якога адпавядаюць выпрамяненню *абсалютна чорнага цела* з т-рай каля 2,7 К. Дыяпазон — ад некалькіх міліметраў да дзесяткаў сантыметраў; практычна ізатропнае — інтэнсіўнасць амаль не залежыць ад напрамку выпрамянення. Тэарэтычна прадказана Дж.*Гамавым* (1949), эксперыментальна выяўлена Р.В.*Вільсанам* і А.А.*Пензіясам* (1965).

Р.в. інтэрпрэтуецца як рэшта (рэлікт) пачатковых стадый эвалюцыі Сусвету (да ўтварэння *галактык* і *зорак*), калі ён меў вельмі высокую т-ру і шчыльнасць выпрамянення (рэчыва знаходзілася ў выглядзе гарачай шчыльнай *плазмы*). Пры далейшым *расшырэнні Сусвету* выпрамяненне астыла да т-ры 2,7 К. Р.в. вызначае шчыльнасць энергіі эл.-магн. выпрамянення (каля 0,25 эВ/см^3) і шчыльнасць фатонаў у Сусвеце (каля 500 фатонаў у 1 см^3). На кожны атам у Сусвеце прыпадае больш за 10^8 рэліктавых фатонаў. Даследуецца ў касмалогіі як крыніца інфармацыі пра раннія стадыі расшырэння Сусвету. Гл. таксама *Касмалогія*. *А.А.Шымбалёў.*

РЭЛІКТЫ (ад лац. relictum астатак), віды і іншыя групы раслін і жывёл, што захаваліся ад флор і фаун мінулых геал. эпох. Р. адрозніваюць па геал. узросце (неагенавыя — метасеквоя, секвоя, хахуля, ледавіковыя — бакаплаў Паласа, карлікавая бяроза, мянтуз, рапушка еўрап., рэліктавая мізіда і інш.), па месцы паходжання (напр., міжземнаморскія, туранскія), экалагічных умовах (напр., гігра- і мезафільныя), па часе ранейшага панавання і пашырэння (напр., неагенавыя, мезазойскія, мелавыя) і інш. Для Р. характэрна ізаляванасць у філагенет. сістэме. Іх падзяляюць на кансерватыўныя (віды, якія амаль не змяніліся пры адносна нязменных умовах асяроддзя) і адаптыўныя, што змяніліся і прыстасаваліся да новых умоў. Таксама адрозніваюць сурэлікты (захоўваюць свой арэал), адаптаны (пашыраюць яго), дэградаванты (скарачаюць арэал і колькасць відаў). Маюць у сабе багатую генет. і геагр. інфармацыю. Выкарыстоўваюцца пры даследаванні гісторыі ўзнікнення і фарміравання *біягеацэназаў*, вывучэнні працэсаў відаўтварэння,

выяўленні філагенет. сувязей. Найб. рэдкія Р. ўключаюць у Міжнар. і нац. Чырв. кнігі. *В.М.Прохараў, А.У.Суднік.*

РЭЛІ́Н, двухслаёвы рулонны матэрыял для засцілання падлогі ў памяшканнях з павышанай вільготнасцю; гумавы *лінолеум*. Верхні слой вырабляюць з каляровай гумы, ніжні — з сумесі здробненай утыльнай гумы і бітуму.

РЭЛЬЕ́Ф (франц. relief ад лац. relevo узнімаю), сукупнасць форм зямной паверхні, разнастайных паводле абрысаў, памераў, паходжання, узросту і гісторыі развіцця. Формы Р. могуць быць дадатныя, або выпуклыя (*горы, узвышшы, узгоркі*), і адмоўныя, або ўвагнутыя (*катлавіны, яры*, рачныя даліны). Паводле маштабаў развіцця вылучаюць планетарныя формы Р. (*мацерыкі, ложа акіянаў*), мегарэльеф (горныя сістэмы, раўніны, упадзіны акіянаў), макрарэльеф (*горныя хрыбты, міжгорныя ўпадзіны*), мезарэльеф (узгоркі, яры), мікрарэльеф (*стэпавыя сподкі*, карставыя варонкі), нанарэльеф (тэрмітнікі, купіны, кратавіны).

Р. увесь час эвалюцыніруе, формы ўтвараюцца, відазмяняюцца, разбураюцца, пахаваны або часткова захоўваюцца ў выглядзе рэліктаў былых геал. эпох. Залежыць ад характару, тыпу і ўзросту горных парод і асн. геал. структур, тэктанічнага развіцця, клімату, гідралаг. і гідрагеал. умоў, хуткасці і асаблівасцей разбурэння ці растварэння парод, пераносу і назапашвання адкладаў. Утвараецца і зменьваецца ў выніку ўзаемадзеяння *эндагенных працэсаў* і *экзагенных працэсаў*. Эндагенныя рухі літасферных пліт і мацерыкоў, землетрасенні, векавыя падняцці і апусканні зямной кары, вулканічныя працэсы ў спалучэнні з уздзеяннем сіл сонечнага і месячнага прыцягнення і звярчэння Зямлі ўтвараюць буйныя структурныя (*морфаструктура*) нярóўнасці Р. сушы і дна Сусв. ак. Узвышаныя тэр. характарызуюцца значнымі абс. і адносnымі вышынямі, стромкасцю схілаў і глыбінямі расчлянення, узрастаннем гравітацыйных працэсаў, *дэнудацыі, эрозіі*. Экзагенныя працэсы, абумоўленыя прамяністай энергіяй Сонца, утвараюць больш дробныя формы Р. (*морфаскульптура*), якія прыводзяць да згладжвання, выраўноўвання Р. Горы разбураюцца, расчляняюцца, набываюць рысы выпрацаванага, дэнудацыйнага і структурна-дэнудацыйнага Р. На фарміраванне Р. (асабліва ў гарах) уплываюць таксама гравітацыйныя працэсы, якія адбываюцца пад уздзеяннем сілы цяжару (лавіны, абвалы, асыпкі, апоўзні). Перавага экзагенных разбуральных працэсаў прыводзіць да пераўтварэння горных краін у хвалістыя дэнудацыйныя раўніны (*пенеплены*). Тэрыторыі, якія паніжаюцца, паступова нівеліруюцца, укрываюцца адкладамі, што зносяцца з больш узвышаных мясцін. На нізінных тэр. утвараецца акумулятыўны Р. са згладжанымі рысамі, увагнутымі схіламі, нязначнымі вышынямі (раўніны, нізіны). Р. садзейнічае дыферэнцыяцыі ландшафтаў і сам зазнае ўплыў *занальнасці геаграфічнай* і *вышыннай пояснасці*. Важныя асаблівасці Р.: наяўнасць мацерыкоў, дзе абсалютныя вышыні да 1000 м складаюць 21,3%, раўніннага мацерыковага шэльфа, апушчанага пад узровень воднай паверхні акіяна да 100—200 м (зрэдку да 350—400 м); *мацерыковага схілу* з нахіламі ад 2—5 да 25° і глыб. да 1500—2000 м, *ложа акіяна*, дзе на глыбіні 4000—5000 м прыпадае 23,3%, 3000—6000 м — 53%. Агульная амплітуда верт. расчлянення Р. Зямлі амаль 20 тыс. м (г. *Джамалунгма* — 8848 м, глыбакаводны *Марыянскі жолаб* — 11022 м). У выніку актыўнага дзеяння экзагенных працэсаў паверхня сушы больш складаная і разнастайная, чым дно акіянаў і мораў. Самымі буйнымі марфалагічнымі тыпамі паверхні сушы з'яўляюцца: раўнінныя краіны (больш за $^1/_3$ плошчы), буйныя ўзвышшы і плато з вял. ўпадзінамі, горныя сістэмы, хрыбты і інш. горныя пабудовы. Паводле марфалагічнай выяўленасці, вышыні над узр. ак. вылучаюцца: *высакагор'і*, якія ўздымаюцца вышэй снегавой лініі, маюць ледавікі, вострыя вяршыні, трогі, ледавіковыя цыркі (Гімалаі, Кардыльеры, Альпы, Каўказ); *сярэднягор'і* з акруглымі вяршынямі, вышыннай пояснасцю, без слядоў абледзянення (Карпаты, Паўд. Урал); *нагор'і* з горнымі хрыбтамі і міжгорнымі масівамі, высока размешчанымі над узр. ак. (Армянскае, Іранскае, Усх. Памір); *плато* і *пласкагор'і* ў выглядзе прыўзнятых эразійных раўнін, абмежаваных уступам; *нізкагор'і* з градамі, гарамі і ўзгоркамі выш. да некалькіх соцень метраў, якія маюць мяккія абрысы і пакатыя схілы (Казахскі драбнасопачнік, Бадхыз, Карабіль); раўніны з плоскімі хвалістым і перасечаным Р., невял. амплітудамі вышынь, часта ўскладненымі градавымі, увалістымі, узгоркавымі і інш. дробнымі формамі (Прыкаспійская, Зах.-Сібірская раўніны). У пераўтварэнні Р. вял. роля належыць чалавеку (гл. *Антрапагенны рэльеф*), які свядома (тэрыконы, дамбы, адвалы, кар'еры) або ўскосна, пры няправільнай гасп. дзейнасці (яры, прасяданне паверхні, разбурэнне і размыванне схілаў і берагоў) зменьвае яго. Р. мае важнае гасп. значэнне. Ён уплывае на кліматычныя ўмовы, расліннасць, глебаўтваральныя працэсы, на спецыялізацыю земляробства і жывёлагадоўлі; яго асаблівасці ўлічваюцца пры праектаванні і буд-ве дарог, трубаправодаў, каналаў, вадасховішчаў, на спосабы здабычы карысных выкапняў і інш. Р. і гісторыю яго фарміравання вывучае *геаморфалогія*.

На Беларусі асн. формамі Р. з'яўляюцца ўзвышшы, раўніны і нізіны, характэрныя рысы якіх вызначаны дзейнасцю ледавікоў. Найб. пашыраныя формы ўласналедавіковыя (марэнныя грады, раўніны і ўзгоркі), флювіягляцыяльныя (зандравыя раўніны, камавыя ўзгоркі, озавыя грады, тэрасы), алювіяльныя (даліны рэк, тэрасы, поймы, старыцы), азёрныя і азёрна-ледавіковыя (нізіны, катлавіны, тэрасападобныя пляцоўкі), эолавыя (дзюны, пясчаныя грады і ўзгоркі), крыягенныя (бугры пучэння).

Літ.: Махачек Ф. Рельеф Земли: Опыт регионального морфол. описания поверхности Земли. Т. 1—2. М., 1959—61; Райс Р.Дж. Основы геоморфологии: Пер. с англ. М., 1980; Матвеев А.В., Гурский Б.Н., Левицкая Р.И. Рельеф Белоруссии. Мн., 1988; Матвеев А.В. История формирования рельефа Белоруссии. Мн., 1990.

В.І.Ярцаў.

РЭЛЬЕ́Ф у мастацтве, двухмерная скульпт. выява на плоскасці; від *скульптуры*. Спецыфічная асаблівасць Р. — непарыўная сувязь з плоскасцю, якая з'яўляецца фіз. асновай і фонам выявы. Разгортванне кампазіцыі на плоскасці дае магчымасць перспектыўнай пабудовы прасторавых планаў і стварэння ілюзіі акругласці аб'ёмаў, тонкая мадэліроўка форм — адлюстроўваць складаныя шматфігурныя сцэны, арх. і пейзажныя матывы (т.зв. жывапісны Р.). Пры гэтым прасторавыя суадносіны могуць перадавацца ўмоўна, скарочана, а формы адпаведна станавіцца больш плоскімі. Паводле адносін да плоскасці вылучаюць пукаты Р. (*барэльеф, гарэльеф*) і паглыблены Р. — контррэльеф («негатыў» барэльефа) і кайланагліф (спалучае паглыблены контур і пукатую мадэліроўку выявы). Уключаецца ў кампазіцыі арх. аздаблення і скульпт. помнікаў, бывае самаст. творам. Шырока выкарыстоўваецца ў *гліптыцы, медальерным мастацтве, мемарыяльных дошках, пячатках, плакетках*.

РЭЛЬЕ́ФУ КА́РТЫ. Адлюстроўваюць рэльеф сушы і марскога дна Зямлі або паверхню інш. касмічных цел. Найб. пашыраны *гіпсаметрычныя карты, батыметрычныя карты, геамарфалагічныя карты, морфаметрычныя карты*. Існуюць таксама морфаграфічныя Р.к. (адлюстроўваюць знешні выгляд рэльефу), фізіяграфічныя (паказваюць рэльеф у перспектыўным адлюстраванні), карты парушанасці рэльефу і мерапрыемстваў па ахове зямной паверхні ад эрозіі, дэфляцыі і інш. неспрыяльных прыродных і тэхнагенных фактараў.

РЭЛЯТЫВІ́ЗМ (ад лац. relativus адносны), метадалагічны прынцып, паводле якога ўсё ў свеце адноснае. Сустракаецца ў розных галінах пазнання і практыкі. Гнасеалагічны Р. узыходзіць да вучэння стараж.-грэч. *сафістаў*, паводле якога ўсе веды павінны разглядацца толькі як адносна правільныя ў сувязі з тым, што іх змест залежыць ад суб'екта пазнання («чалавек ёсць мера ўсіх рэчаў»), ад яго душэўнага і фіз. стану (Горгій, Пратагор). У 16—17 ст. Р. выкарыстоўвалі для крытыкі рэліг. догматаў і метафізікі (П.Бейль, М. дэ Мантэнь, Эразм Ратэрдамскі). З 18 ст. распаўсюджваецца анталагічны Р., прыхільнікі якога не прызнавалі існавання аб'ектыўных законаў прыроды і грамадства і абвяшчалі *суб'ектывізм* пазнання (Дж.Берклі, Д.Юм). Прадстаўнікі дыялект. матэрыялізму не пагаджаліся з прынцыпам Р., але прызнавалі адноснасць ведаў, абумоўленасць пазнання ўзроўнем развіцця прадукц. сіл і навукі. На мяжы 19—20 ст. Р. набыў папулярнасць у *махізме, неапазітывізме, прагматызме* і інш., прадстаўнікі якіх абвяшчалі абсалютную адноснасць ведаў (Э.Мах, І.Петцальт) ці іх поўную ўмоўнасць (А.Пуанкарэ). Этычны Р. абвяшчае адноснасць агульнапрынятых маральных норм, часам выкарыстоўваецца для ігнаравання маральных асноў грамадства, апраўдання *амаралізму*. Р. характэрны таксама для гістарыяграфіі, мастацтвазнаўства і інш. гуманіт. дысцыплін, у распараджэнні якіх няма адназначна вывераных, дакладных крытэрыяў і ацэнак. Адрозніваюць таксама фізічны Р., які грунтуецца на *адноснасці тэорыі*.

С.А.Яцкевіч.

РЭЛЯТЫВІ́СЦКАЯ ІНВАРЫЯ́НТНАСЦЬ, Лорэнц-інварыянтнасць, няз-

меннасць (*інварыянтнасць*) законаў прыроды адносна *Лорэнца пераўтварэнняў*. Вынікае з *адноснасці тэорыі* і выражае эквівалентнасць *інерцыяльцых сістэм адліку*. У адпаведнасці з Р.і. ўраўненні, што апісваюць магчымыя фіз. працэсы, маюць ва ўсіх інерцыяльных сістэмах адліку аднолькавы выгляд.

РЭЛЯТЫВІ́СЦКАЯ МЕХА́НІКА, фізічная тэорыя, якая вывучае законы руху часціц (цел) са скарасцямі, параўнальнымі са скорасцю святла ў вакууме.

Асн. ўраўненні Р.м. — рэлятывісцкае абагульненне 2-га закону Ньютана (гл. *Ньютана законы механікі*) і рэлятывісцкі закон захавання энергіі-імпульсу — грунтуюцца на пастулатах спец. *адноснасці тэорыі*. Рэлятывісцкая часціца характарызуецца поўнай энергіяй $E = E_0/\sqrt{1-\frac{v^2}{c^2}}$ і імпульсам $\vec{p} = m\vec{v}/\sqrt{1-\frac{v^2}{c^2}}$, дзе $E_0 = mc^2$ — энергія спакою часціцы з масай m; $\vec{v}$ — скорасць часціцы; c — скорасць святла ў вакууме. З сувязі, якая існуе паміж велічынямі E і $\vec{p}$, вынікае, што $E^2/c^2 - p^2 = m^2c^2$ з'яўляецца *інварыянтам* (закон захавання энергіі-імпульсу). Пры скарасцях руху цел $v \ll c$ Р.м. пераходзіць у *класічную механіку*.

РЭЛЯТЫВІ́СЦКІЯ ЭФЕ́КТЫ, фізічныя з'явы, якія назіраюцца пры скарасцях руху, параўнальных са скорасцю святла ў вакууме. Вынікаюць з *Лорэнца пераўтварэнняў* і разглядаюцца ў спец. *адноснасці тэорыі*. Да іх адносяць: рэлятывісцкае скарачэнне падоўжных (у напрамку руху) даўжынь, рэлятывісцкае запавольванне часу і інш. Рэлятывісцкімі наз. таксама эфекты агульнай тэорыі адноснасці (рэлятывісцкай тэорыі прыцягнення), напр., эфект запавольвання часу ў моцным гравітацыйным полі.

РЭМ (Remus), паводле старажытнарымскага падання, брат-блізня *Ромула*, легендарнага заснавальніка Рыма. Забіты Ромулам у час сваркі.

РЭМАНТА́НТНЫЯ РАСЛІ́НЫ, расліны, здольныя да паўторнага або шматразовага цвіцення і плоданашэння на працягу аднаго вегетац. перыяду. Маюць вельмі кароткі перыяд спакою і здольнасць перыядычна (на працягу 2—3 тыдняў) закладваць пладовыя пупышкі, якія хутка прарастаюць, адбываецца аддзяленне бутонаў, цвіценне і плоданашэнне амаль да замаразкаў. Да Р.р. належаць травяністыя (напр., алісум, лабелія, рэмантантны гваздзік), дэкар.-кустовыя (рэмантантныя і чайнагібрыдныя ружы, некат. віды спірэі), цытрусавыя, ягадныя (некат. сарты суніц і малін) культуры. Пры спрыяльных пагодных умовах (цёплая і вільготная восень пасля сухога лета) рэмантантнасць бывае ў бэзу, вішні, грушы, яблыні і інш. Пры паўторным цвіценні і плоданашэнні кветкі і плады драбнеюць, насенне горш узыходзіць. Выкарыстоўваюцца ў дэкар. і аматарскім садаводстве, кветкаводстве. *В.М.Прохараў.*

РЭМА́РК (Remarque, Remark) Эрых Марыя (22.6.1898, г. Оснабрук, Германія — 25.9.1970), нямецкі пісьменнік. Удзельнік 1-й сусв. вайны. Працаваў настаўнікам, журналістам, рэдактарам. З 1932 у эміграцыі (Швейцарыя, ЗША). Сусв. вядомасць прынёс раман «На Заходнім фронце без перамен» (1929, экранізацыя 1980), які разам з раманамі «Вяртанне» (1931) і «Тры таварышы» (1938) склалі своеасаблівую трылогію пра 1-ю сусв. вайну і яе трагічныя наступствы ў лёсах франтавікоў, т.зв. страчанага пакалення. У раманах «Палюбі бліжняга свайго» (1940), «Трыумфальная арка» (1946, экранізацыя 1985)

Э.М.Рэмарк.

«Ноч у Лісабоне» (1962) тэма ням. эмігрантыі, у рамане «Іскра жыцця» (1952) — фаш. канцлагераў, у сатыр. рамане «Чорны абеліск» (1956) — сац.-эканам. і псіхал. вытокаў фашызму. Раман «Час жыць і час паміраць» (1954) і драма «Апошні прыпынак» (1956, паст. Бел. т-рам імя Я.Коласа ў 1957) пра падзеі на сав.-герм. фронце ў 2-ю сусв. вайну. Аўтар сац.-псіхал. раманаў «Жыццё ў пазыку» (1959), «Цені ў раі» (выд. 1971), «Зямля запаветная» (выд. 1998, незавершаны). Рэаліст. раманы Р. адметныя прысутнасцю ў іх паэтыцы элементаў натуралізму, імпрэсіянізму і экспрэсіянізму, глыбокім псіхалагізмам, лаканізмам мовы ў спалучэнні з яе вобразнасцю. Яго творчасць паўплывала на развіццё сусв. пасляваен. л-ры. На бел. мову раманы «На Заходнім фронце без перамен», «Тры таварышы» пераклалі Х.Шынклер, У.Папковіч.

Тв.: Бел. пер. — На Заходнім фронце без перамен. Мн., 1931; Тры таварышы. Мн., 1994; Рус. пер. [Собр. соч. Т. 1—11]. М., 1991; Земля обетованная. М., 2001.

Літ.: Сучков Б.Л. О книгах Э.М.Ремарка // Сучков Б.Л. Лики времени. М., 1976. Т. 2; Николаева Т.С. Творчество Ремарка-антифашиста. Саратов, 1983. *Е.А.Лявонава.*

РЭМА́РКА (ад франц. remarque памета), 1) заўвага аўтара тэксту (кнігі, рукапісу, пісьма), што ўдакладняе ці дапаўняе нейкія дэталі. 2) У драматургіі, тэатры — тлумачэнне, указанне драматурга для чытача, пастаноўшчыка, акцёра ў тэксце п'есы. Змяшчае кароткую характарыстыку абставін дзеяння, знешні выгляд, манеру вымаўлення, асаблівасці паводзін персанажаў. Мае важнае значэнне для разумення п'есы пры чытанні і пры пастаноўцы яе на сцэне. Р. называюць і паметы рэжысёра на рабочым экзэмпляры п'есы, адрасаваныя асістэнту рэжысёра, заг. пастановачнай часткі і інш. 3) Уграўюры — накід у баку ад асн. выявы. З'явілася ў выніку выпрабавання інструментаў пры рабоце над гравюрнай дошкай, іншы раз мае і самаст. маст. значэнне.

РЭМБО́ (Rimbaud) Жан Нікала Арцюр (20.10.1854, г. Шарлевіль-Мезьер, Францыя — 10.11.1891), французскі паэт. Усе свае шэдэўры стварыў у 15—19-гадовым узросце. Пасля 1875 адышоў ад паэзіі, займаўся гандлем. У першых вершах ап'яненне жаданай свабодай («Адчуванне», «Мая багема»), смелыя эксперыменты з гукамі і паэт. вобразамі («Афелія», «Шукальніцы вошай», «Галосныя»), знішчальныя інвектывы ў адрас правінцыяльнага мяшчанства («На музыцы», «На кукішках»), віноўнікаў бессэнсоўнай вайны («Ліха», «Які спіць у лагчыне»), хрысц. набожнасці і пакорлівасці («Вячэрняя малітва», «Беднякі ў храме», «Першае прычасце»), ворагаў Парыжскай камуны («Парыжская оргія, або Парыж засяляецца зноў»). Адна з вяршынь яго паэзіі — верш «П'яны карабель» (1871) — усхваляваная споведзь у выглядзе малой прыгодніцкай адысеі, шэраг нечаканых вобразаў, убачаных на мяжы сну і явы. Стварыўшы своеасаблівую тэорыю паэт. яснабачання, Р. імкнуўся да таямніц існага, зрабіць творчасць інструментам карэннага абнаўлення свету, вызваліць несвядомае ад абмежаванняў цвярозага розуму (кн. вершаў у прозе «Азарэнні», выд. 1886). Апошняя кн. «Сезон у пекле» (1873) — развітанне паэта з марамі пра звышзадачу змяніць свет. На бел. мову асобныя яго вершы перакладалі Р.Барадулін, А.Мінкін, Я.Семяжон, М.Федзюковіч.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Паэты Парыжскай камуны. Мн., 1971; У кн.: Семяжон Я.Сем цудаў свету: Выбр. пераклады паэзіі. Мн., 1977; У кн.: Кахаць — гэта значыць... Мн., 1986; Рус. пер. — Произведения. М., 1988; Озарения. СПб., 1994.

Літ.: Карре Ж.М. Жизнь и приключения Жана Артюра Рембо // Рембо Ж.А. Пьяный корабль: Пер. с фр. М., 2000; Птифис П. Артюр Рембо. М., 2000. *А.В.Хадановіч.*

РЭ́МБРАНТ [Rembrandt; сапр. ван Рэйн (van Rijn) Рэмбрант Харменс; 15.7.1606, г. Лейдэн, Нідэрланды — 4.10.1669], галандскі жывапісец, рысавальшчык і афартыст; адзін з найбуйнейшых прадстаўнікоў галандскага барока і сусв. маст. культуры. Вучыўся ў Лейдэнскім ун-це (1620), жывапісу — у Я. ван Сваненбюрха ў Лейдэне (каля 1620—23), у П.Ластмана ў Амстэрдаме (1623). У творчасці імкнуўся да філас. асэнсавання жыцця, багацця і разнастайнасці ўнутр. свету чалавека. Пісаў пераважна партрэты, у т.л. групавыя, біблейскія і міфалагічныя сцэны. У 1625 адкрыў сваю майстэрню ў Лейдэне, хутка дасягнуў шырокага прызнання. Раннія творы, у якіх адчувальны ўплыў Ластмана і галандскіх караваджыстаў, вызначаліся рэзкай паліхроміяй і экспрэсіўнасцю вобразаў: «Пакутніцтва св. Стэфана» (1625), «Валаам», «Товій і Анёл» (абодва 1626), «Прынясенне ў

храм» (каля 1628—29), «Давід і Галіяф» і інш. Пазней пісаў больш глыбокія і вытанчаныя карціны, якім уласцівы гармонія цёплых чырвона-карычневых тонаў і таямнічыя эфекты святлаценю: «Уцёкі ў Егіпет» (1627), «Самсон і Далі-ла» (1628), «Сімяон у храме» (1631) і інш. З 1631 жыў у Амстэрдаме, пісаў пераважна заказныя партрэты, аўтапар-

Рэмбрант. Аўтапартрэт з Саскіяй. Каля 1635.

Рэмбрант. Вяртанне блуднага сына. Каля 1668—69.

трэты і партрэты сваіх блізкіх. Творы адметныя пластычнасцю, эксперыментамі ў пошуках псіхал. выразнасці, дэтальнай перадачай рысаў твару, адзення, каштоўнасцей, часам тэатралізаванымі эфектамі. У карціне «Урок анатоміі доктара Н.Цюлпа» (1632) па-наватарску вырашыў праблему групавога партрэта праз наданне кампазіцыі дынамічнай разняволенасці партрэтаваных і аб'яднанне іх адзіным дзеяннем. У «Аўтапартрэце з Саскіяй» («Вясёлая кампанія», каля 1635), які вызначаецца свабоднай манерай жывапісу, мажорным, напоўненым святлом залацістым каларытам, адышоў ад тагачасных маст. канонаў, выявіўшы жыццёвую непасрэднасць кампазіцыі. У карціне «Даная» (1636) проціпаставіў рэнесансавым пачуццёвацялесным ідэалам прыгажосці адухоўленасць і цеплыню інтымнага чалавечага пачуцця. Сярод інш. твораў гэтага перыяду: партрэты «Вытанчаная пара ў інтэр'еры», «Партрэт бургграфа», «Саскія ўсміхаецца» (усе 1633), рэліг. і міфалагічныя карціны «Святая сям'я» (1631), «Выкраданне Еўропы» (1632), серыя «Пакуты Хрыстовы» (1633—39), «Ахвярапрынашэнне Аўраама», «Выкраданне Ганімеда» (абедзве 1635), «Асляпленне Самсона» (1636), «Вяселле Самсона» (1638) і інш. З 1639 жыў у Брэстраце (цяпер Рэмбрантхёйс). У 1640-я г. паміж творчасцю Р. і эстэт. патрабаваннямі тагачаснага грамадства адбыўся канфлікт, апагеем якога стала непрыняцце заказчыкамі групавога партрэта «Начная варта» (1642), вырашанага праз гераіка-прыўзнятую кампазіцыю, больш уласцівую для гіст. карціны. Творчасць гэтага перыяду страціла знешнюю эфектнасць і мажорнасць, работам уласцівы нарастанне інтэнсіўнасці светлавых эфектаў, якія запаўняюць усю кампазіцыю і вызначаюць форму і фактуру выяў, пастознасць пісьма, цікавасць да пабудовы і архітэктонікі прасторы: «Давід і Іанафан» (1642), «Дзяўчына каля акна», «Святая сям'я» (абодва 1645), «Пакланенне вешчуноў» (1648), «Хрыстос у Эмаўсе» (1648), «Партрэт старога ў чырвоным» (1652—54), «Вірсавія», «Партрэт жонкі брата мастака» (абодва 1654), «Бласлаўленне Іакава» (1656), «Сын Цітус чытае» (1657), «Асур, Аман і Эсфір» (1660), «Змова Юлія Цывіліса» (1661), «Давід і Урыя» (1665) і інш. Каля 1668—69 стварыў манум. палатно «Вяртанне блуднага сына», у якім віртуозна перадаў складаную гаму глыбокіх чалавечых пачуццяў. Аўтар афортаў «Прадавец пацучынага яду» (1632), «Тры дрэвы» (1643), «Хрыстос вылечвае хворых» («Аркуш у сто гульдэнаў», 1649), «Тры крыжы» (1653) і інш., малюнкаў. Іл. гл. таксама да арт. *Даная*, *Нідэрланды*.

Літ.: Рембрандт: Художеств. культура Западной Европы XVII в. М., 1970; Лазарев В.Н. Рембрандт-портретист // Лазарев В.Н. Старые европейские мастера. М., 1974; Егорова К.С. Портрет в творчестве Рембрандта. М., 1975; Ротенберг Е. И. Рембрандт // Ротенберг Е.И. Западноевропейская живопись 17 в.: Тематич. принципы. М., 1989.

Я.Ф.Шунейка.

РЭМЕ́ДЫУМ (лац. remedium сродак супраць чаго-н.), дазволенае законам адхіленне вагі і пробы манеты ад устаноўленай нормы. Р. прадухіляў псаванне паўнацэнных манет і магчымасць абарачэння манет, у якіх фактычная залатая вартасць адхілялася ад законнай нормы.

РЭ́МЕЗ Яўген Якаўлевіч (17.2.1896, г. Мсціслаўль Магілёўскай вобл. — 30.8.1975), украінскі матэматык. Чл.-кар. АН Украіны (1939). Скончыў Кіеўскі ін-т нар. адукацыі (1924). У 1933—55 у Кіеўскім пед. ін-це, у 1935—38 у Кіеўскім ун-це. Адначасова з 1935 у Ін-це матэматыкі АН Украіны. Навук. працы па канструктыўнай тэорыі функцый і набліжаным аналізе. Распрацаваў агульныя выліч. метады набліжэння функцый, атрымаў важныя абагульненні тэарэм характарызацыі Чабышова—Маркава, стварыў агульны аператарны метад пабудовы астаткавых членаў.

Літ.: История отечественной математики. Т. 1—4. Киев, 1966—70.

РЭ́МЕЗАЎ Сямён Ульянавіч (каля 1642 — пасля 1720), расійскі географ, картограф і гісторык Сібіры. Склаў планы і зрабіў апісанні г. Табольск і Табольскага павета (1683—1710). У 1696—97 даследаваў бас. р. Табол, нанёс яе і буйныя прыткі на карту. У 1699—1701 склаў рукапісную «Чарцёжную кнігу Сібіры» — першы расійскі геагр. атлас з 23 карт, якім абагульніў рускія геагр. адкрыцці 16—17 ст.

РЭ́МЕЗЫ (Remizinae), падсямейства птушак сям. сініцавых. 4 роды: Anthoscopus (6 відаў, пашыраны ў Афрыцы), Auriparus (1 від, на ПдЗ Паўн. Амерыкі), Cephalopyrus (1 від, у Паўд. і Паўд.-Усх. Азіі) і рэмез — Remiz (1 від, 10 падвідаў, пашыраны ў Еўропе і Азіі). Аселыя і пералётныя птушкі. Жывуць па берагах вадаёмаў. На Беларусі Р. звычайны (R. pendulinus) трапляецца пераважна ў пойме р. Прыпяць, занесены ў Чырв. кнігу.

Да арт. **Рэмезы**: рэмез звычайны і яго гняздо.

Даўж. да 11,5 см, маса да 11 г. Афарбоўка каштанавая, вохрыстая і шэрая. Кормяцца насякомымі, павукамі, насеннем. Гнёзды Р. звычайнага шарападобныя, падвешаныя на галінах або трыснягу. Адкладваюць 5—6, зрэдку да 10 яец. *П.У.Пінчук.*

РЭ́МЕК (Remek) Уладзімір (н. 26.9.1948, г. Чэске-Будзеёвіцы, Чэхія), першы касманаўт Чэхаславакіі. Герой Чэхаславакіі (1978). Герой Сав. Саюза (1978). Лётчык-касманаўт Чэхаславакіі (1978). Палкоўнік-інжынер (з 1995 у адстаўцы).

У.**Рэмек**.

Скончыў Вышэйшае авіяц. вучылішча ў г. Кошыцы (1970), Ваенна-паветр. акадэмію імя Ю.А.Гагарына (1976). З 1976 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў. 2—10.3.1978 з А.А.*Губаравым* здзейсніў (як касманаўт-даследчык) палёт на касм. караблі «Саюз-28» (першы ў свеце міжнар. экіпаж) па праграме «*Інтэркосмас*» і арбітальнай станцыі «Салют-6» (асн. экіпаж Ю.В.*Раманенка*, Г.М.*Грэчка*) з прыстыкаваным да яе касм. караблём «Саюз-27». Правёў у космасе 7,9 сут. *У.С.Ларыёнаў.*

РЭ́МЕНЫ (Reményi) Эдэ [сапр. Гофман (Hoffmann); 17.1.1828, г. Мішкальц, Венгрыя — 15.5.1898], венгерскі скрыпач і кампазітар. Вучыўся ў Венскай кансерваторыі (1842—45). Выступаў у ансамблі з І.Брамсам. З 1854 прыдворны саліст у Лондане. З 1860 у Будапешце, з 1875 у Парыжы, Нью-Йорку. Ігра вызначалася вогненным тэмпераментам, бліскучай віртуознасцю, свабоднай імправізацыяй. Сярод твораў: канцэрт для скрыпкі з арк., п'есы ў нар. венг. духу для скрыпкі сола («Венгерскія мелодыі» і інш.) і з фп., скрыпічных транскрыпцый фп. п'ес Ф.Шапэна, у т.л. мазурак і паланэзаў, вальсаў і інш.

РЭ́МІЗАЎ Аляксей Міхайлавіч (6.7.1877, Масква — 26.11.1957), рускі пісьменнік. Друкаваўся з 1902. Пошукі архаічнага стылю, арыентаванага на л-ру і вуснае слова «дапятроўскай» Русі ў кн. «Ліманар, сірэч: Луг духоўны» (1907), «Міколавы прытчы» (1917). У раманах «Сажалка» (1905), «Плачужная канава» (1923—25), аповесці «Пятая язва» (1912), у «летапіснай» аповесці «Узвіхраная Русь» (1927) — вобраз рас. правінцыі і С.-Пецярбурга, тэмы недарэчнасці жыцця, душэўнай дысгармоніі, чалавечых пакут. «Слова пра пагібель Рускай зямлі» (1918) — ліраэпічная «гістарыясофія» Расіі, асэнсаванне падзей 1-й сусв. вайны і Лют. рэвалюцыі 1917. Аўтар драм. твораў у духу сярэдневяковых містэрый («Трагедыя пра Іуду, прынца Іскарыёцкага», 1909; «Цар Максімілян», 1919), біягр. кн. «Падстрыжанымі вачыма» (1951), кн. «Агонь рэчаў. Сны і перадсонне. Гогаль. Пушкін. Лермантаў. Тургенеў. Дастаеўскі» (1954), апрацовак казак, паданняў, апокрыфаў і інш. З 1921 у эміграцыі.

Тв.: Соч. Кн. 1—2. М., 1993; Избранное. М., 1978; Избранное. Повести. Лит. силуэты. Воспоминания. М., 1992; В розовом блеске: Автобиогр. повествование. Роман. М., 1990.

Літ.: Алексей Ремизов: Исслед. и материалы. СПб., 1994.

РЭМІЛІТАРЫЗА́ЦЫЯ (ад *рэ...* + *мілітарызацыя*), аднаўленне ваен. магутнасці, ваен.-эканам. патэнцыялу дзяржавы (ч. яе тэр.) пасля дэмілітарызацыі. Напр., Германія анулявала ваен. артыкулы *Версальскага мірнага дагавора 1919*, аднавіла ваен. магутнасць і распачала падрыхтоўку да *рэваншу*. Пасля 2-й сусв. вайны Р. найб. характэрна для дзяржаў, якія ў адпаведнасці з міжнар. дагаворамі ў 2-й пал. 1940-х г. былі дэмілітарызаваны, потым аднавілі свой ваен.-эканам. і тэхн. патэнцыял (напр., ФРГ, Італія, Румынія і інш.).

РЭМІНІСЦЭ́НЦЫЯ (ад лац. reminiscentia успамін) у псіхалогіі, адтэрмінаванае больш поўнае і дакладнае аднаўленне захаванага ў памяці матэрыялу ў параўнанні з першапачаткова ўспрынятым (завучаным). Назіраецца ў працэсе запамінання рознага вербальнага і нагляднага матэрыялу (тэксты, вершы, спісы, наборы малюнкаў, прадметаў), а таксама пры замацаванні сенсаматорных навыкаў. Асабліва выразна праяўляецца пры рабоце з лагічна звязаным матэрыялам вял. аб'ёму, які аказвае эмацыянальнае ўздзеянне на чалавека. Часцей сустракаецца ў дзіцячым узросце.

РЭМІНІСЦЭ́НЦЫЯ ў літаратуры, свядомае ці міжвольнае ўзнаўленне паэтам маст. вобраза або вобразнай канструкцыі з твора інш. аўтара, уключэнне іх як своеасаблівага ідэйна-маст. кампанента ў свой твор. Напр., выразна адчуваецца арыентацыя на вядомы вобраз, упершыню ўжыты Ф.Скарынай (прадмова да кн. «Юдзіф»), у вершы Р.Барадуліна «Аплакалі вырай совы»:

> Па граю першыя
> Тужаць
> Праталіны белабрысыя,
> **Ведаюць гнёзды птушкі,**
> **І рыбы чуюць віры свае.**

Вядомы таксама выпадкі аўтарэмінісцэнцыі:

> Бывай здаровы, **мужыцкі народзе,**
> Жыві ў шчасці, жыві ў свабодзе
> І часам спамяні пра **Яську** свайго,
> Што загінуў за **праўду** для дабра твайго.
> А калі слова пяройдзе ў дзела,
> Тады за **праўду** станавіся смела,
> Бо адно з **праўдай** у грамадзе згодна
> Дажджэш, народзе, старасці свабодна.

(К.Каліноўскі.«Пісьмо з-пад шыбеніцы»).
А.А.Майсейчык.

РЭМІ́СІЯ (ад лац. remissio памяншэнне, паслабленне) у эканоміцы, акругленне сумы плацяжу на рахунку ў бок памяншэння.

РЭМІ́СІЯ ў медыцыне, перыяд цячэння хваробы, які характарызуецца часовым аслабленнем (няпоўная) або знікненнем яе праяў (поўная). Адрозніваюць Р. тэрапеўт. (пад уплывам лячэння), спантанную (звычайна — заканамерны этап развіцця хваробы), таксама звязаныя з псіхічнымі захворваннямі (астэнічную, гіперстэнічную, неўрозападобную і інш.).

РЭМІТЭ́НТ [ад лац. remittens (remittentis) які адсылае], уладальнік *вэксаля*, які мае права на атрыманне пазначанай у ім сумы грошай. Асоба, пазначаная ў якасці атрымальніка грошай на самім вэксалі, наз. першым Р. Пры перадачы вэксаля законным Р. з'яўляецца асоба, якая асноўвае сваё права на неперарыўным шэрагу *індасаментаў*. Калі Р. набыў вэксаль нядобрасумленна або, набываючы яго, зрабіў грубую неасцярожнасць, ён абавязаны перадаць яго былому ўладальніку. Р. мае права на атрыманне плацяжу па вэксалі ад акцэптанта (вэксалядаўца простага вэксаля). Р. належаць таксама інш. правы, прадугледжаныя вэксальным заканадаўствам.

РЭ́МШАЙД (Remscheid), горад у Германіі, зямля Паўн. Рэйн-Вестфалія, каля р. Вупер. Каля 130 тыс. ж. (2000). Трансп. вузел. Прам-сць: маш.-буд. (значнае станкабудаванне), металург. (выт-сць спецсталяў), тэкстыльная. Масты цераз р. Вупер звязваюць Р. з г. *Золінген*.

РЭН (Rennes), горад на З Францыі. Адм. ц. дэпартамента Іль і Вілен, гал. горад гіст. вобласці *Брэтань*. Вядомы да н.э. Каля 220 тыс. ж., з прыгарадамі больш за 250 тыс. ж. (2000). Буйны вузел чыгунак і аўтадарог, каналам Іль—Ранс злучаны з зал. Сен-Мало (Ла-Манш). Прам-сць: с.-г. і эл.-тэхн. машынабудаванне, аўтамабілебудаванне, хім., тэкст., харчовая. 2 ун-ты. Музеі. Арх. помнікі 11—18 ст.

РЭН (Wren) Крыстафер (20.10.1632, Іст-Нойл, Вялікабрытанія — 25.2.1723), англійскі вучоны і архітэктар; буйны прадстаўнік англ. класіцызму. Вучыўся ў Оксфардскім ун-це (паміж 1649—53). З 1657 праф. астраноміі ў Лондане, з 1661 — у Оксфардзе. У 1668—1718 гал. захавальнік каралеўскіх будынкаў. У 1681—83 прэзідэнт Лонданскага каралеўскага т-ва. Арх. творам Р. ўласцівы свабоднае выкарыстанне ордэрных элементаў і кампазіцыйная разнастайнасць, стройнасць прапорцый і парадная манументальнасць, вытанчанасць дэталей: 52 прыходскія цэрквы ў раёне Сіці (у т.л. Сент-Мэры-ле-Боу, 1670—80), сабор св. Паўла (1675—1710), Грынвіцкі шпіталь (1696—1716, у сааўт.) у Лондане, б-ка Трыніты-каледжа ў г. Кембрыдж (1676—84).

РЭНАВА́ЦЫЯ (ад лац. renovatio абнаўленне, аднаўленне), эканамічны працэс замяшчэння ўстарэлых сродкаў вытв-сці новымі. Ажыццяўляецца шляхам замены асобных сродкаў працы, *рэканструкцыі* ці стварэння новых прадпрыемстваў замест ліквідаваных. Крыніцай Р. служаць амартызацыйныя адлічэнні (гл. *Амартызацыя*).

РЭНА́Р (Renard) Жуль (22.2.1864, Шалон-сюр-Мен, Францыя — 22.5.1910), французскі пісьменнік. Дэбютаваў як паэт-сімваліст (зб. вершаў «Ружы», 1886). Першы буйны празаічны твор — раман «Макрыцы» (1887) пра жыццё вясковых буржуа. У рамане «Паразіт» (1892) сатыр. вобраз пісьменніка-псеўдабунтаўшчыка і прычыны яго дэградацыі. Тэмы дзяцінства і вёскі распрацоўваў у рамане «Рыжык» (1894). Аўтар зб-каў нарысаў і апавяд. «Патайны ліхтар» (1893), «Вінаградар у сваім вінаградніку» (1894), «Буколікі» (1896), «Нашы суровыя браты» (1908) пра сял. побыт, п'ес, у т.л. «Ханжа» (1909) і інш. Найбуйнейшы яго твор — «Дзённік» (выд. 1927), у якім адлюстраваны светапогляд і прынцыпы Р., грамадскае і культ. жыццё Францыі канца 19 — пач. 20 ст.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1946; Дневник. М., 1965. *А.В.Хадановіч.*

РЭНА́РД Канстанцін Густававіч (28.10.1884, г. Чавусы Магілёўскай вобл. — 27.7.1961), бел. вучоны ў галіне селекцыі і насенняводства. Д-р с.-г. н. (1944), праф. (1925). Скончыў Кіеўскі політэхн. ін-т (1910). У 1919—31 у Горы-Горацкім земляробчым ін-це (заг. кафедры). Навук. працы па селекцыі лёну і збожжавых культур, кветкаводстве.

Тв.: Пивоваренный ячмень и его возделывание. М.; Л., 1925; Лен-долгунец. М.; Л., 1925; Пшеница. Смоленск, 1935 (разам з І.Нікуліным); Цветоводство в Омской области. Омск, 1959.

РЭНАТУРА́ЦЫЯ (ад *рэ*... + лац. natura прыродныя ўласцівасці, сутнасць), зваротны пераход малекулы *біяпалімера* з неактыўнага (дэнатураванага) стану ў біялагічна актыўны. Пры Р. праяўляецца здольнасць бялкоў да самаарганізацыі, шлях якой вызначаны паслядоўнасцю амінакіслот у поліпептыдным ланцугу, дэтэрмінаванай спадчыннай інфармацыяй. Здольнасць ДНК да Р. выкарыстоўваецца для атрымання штучных гібрыдных малекул ДНК (т.зв. малекулярная гібрыдызацыя). Гл. таксама *Дэнатурацыя*.

РЭНЕГА́ДАС (ісп. renegados ад позналац. renegatus *рэнегат*), у арабскіх дзяржавах Пірэнейскага п-ва ў 8—15 ст. хрысціяне, якія прынялі *іслам*; разглядаліся хрысціянскай царквою як «адступнікі» (рэнегаты).

РЭНЕГА́Т (позналац. renegatus ад лац. renego адракаюся), чалавек, які здрадзіў сваім перакананням і перайшоў у лагер праціўніка; таксама адступнік, які адрокся ад сваёй веры.

РЭНЕ́ЙСКІ Віктар Іосіфавіч (н. 24.1.1967, г. Бабруйск Магілёўскай вобл.), бел. спартсмен, веславанне на каноэ. Засл. майстар спорту Беларусі (1989). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1990). Чэмпіён XXIV Алімп. гульняў (1988, Сеул) на каноэ-двойцы (у пары з М.Жураўскім, Малдова) на дыстанцыях 500 і 1000 м; сярэбраны прызёр XXVI Алімп. гульняў (1996, г. Атланта, ЗША); 9-разовы чэмпіён свету на розных дыстанцыях (1989, 1990, 1991), сярэбраны прызёр (1991, 1995). 8-разовы чэмпіён СССР.

РЭ́НЕР (Renner) Карл (14.12.1870, Дольні-Дунаёвіцы, Чэхія — 31.12.1950), аўстрыйскі паліт. і дзярж. дзеяч. Юрыст. З 1907 дэп. рэйхсрата Аўстра-Венгрыі. У кастр. 1918 — чэрв. 1920 дзярж. канцлер і адначасова ў ліп. 1919 — кастр. 1920 дзярж. сакратар замежных спраў Аўстр. Рэспублікі. Падпісаў *Сен-Жэрменскі мірны дагавор 1919*. У 1920—34 чл. Нац. савета, у 1931—33 яго першы прэзідэнт. У 1938 выступаў за *аншлюс*. З крас. 1945 дзярж. канцлер часовага ўрада Аўстрыі, са снеж. 1945 федэральны прэзідэнт адноўленай Аўстр. Рэспублікі. Адзін з ідэолагаў аўстрамарксізму, аўтар прац «Абнаўленне Аўстрыі» (т. 1—3, 1916), «Марксізм, вайна і Інтэрнацыянал» (1917), «Дзяржаўная гаспадарка, сусветная эканоміка і сацыялізм» (1929), «На рубяжы двух часоў» (1946, аўтабіяграфія), «Чалавек і грамадства» (апубл. ў 1952).

Літ.: Кретинин С.В. Карл Реннер: жизнь и деятельность (1870—1950) // Новая и новейшая история. 1999. №5.

РЭНЕСА́НС (франц. Renaissance Адраджэнне, ад лац. renaître адраджацца), эпоха ў гісторыі еўрап. культуры, пераходная ад сярэдневякоўя да новага часу. Гл. *Адраджэнне*.

РЭ́НІ (Reni) Гвіда (4.11.1575, г. Вергата, Італія — 18.8.1642), італьянскі жывапісец. Зазнаў уплыў братоў Карачы, вывучаў творчасць Рафаэля, Караваджа, ант. мастацтва. Працаваў пераважна ў Рыме (з 1605) і Балонні (з 1622). У творчасці спалучаў вытанчанасць гарманічна-ясных, часта рэльефападобных кампазіцый з каларытам, пабудаваным на градацыях цёплых залацістых ці высветленых серабрыстых тонаў; у балонскі перыяд узмацніліся рысы элегантнай халоднай ідэалізацыі, часам сентыментальнасці. Сярод твораў: фрэска «Аўрора» ў Палацца Палавічыні-Распільёзі ў Рыме (каля 1610), карціны «Юнацтва дзевы Марыі» (1610-я г.), «Віфлеемскае забіванне немаўлят» (1612), «Аплакванне Хрыста» (1614—18), «Іосіф і жонка Пентэфрыя» і інш. *Я.Ф.Шунейка.*

РЭ́НІЙ (лац. Rhenium), Re, хімічны элемент VII групы перыяд. сістэмы, ат. н. 75, ат. м. 186, 207. Прыродны Р. — сумесь 2 ізатопаў: стабільнага ^{185}Re (37,4%) і слабарадыеактыўнага ^{187}Re (перыяд паўраспаду $5 \cdot 10^{10}$ гадоў). У зямной кары $7 \cdot 10^{-8}$% па масе (*рассеяны элемент*); ізаморфна замяшчае малібдэн у *малібдэніце*. Адкрыты ў 1925 ням. фізікахімікамі В. і І. Ноддак (муж і жонка); назва ад лац. Rhenus — р. Рэйн.

Серабрыста-шэры пластычны метал, $t_{пл}$ 3180 °С (па тугаплаўкасці другі пасля *вальфраму*), шчыльн. 21 010 кг/м^3. Хімічна ўстойлівы. Растварэцца ў азотнай і гарачай канцэнтраванай сернай к-тах, пераксідзе вадароду (утвараецца рэніевая к-та $HReO_4$). Пры нагрэванні ў паветры (t >300 °С) акісляецца, узаемадзейнічае з фторам (адзіны метал, які ўтварае ўстойлівы гептафтарыд ReF_7 — крышт. рэчыва з $t_{пл}$ 48,3 °С), хлорам, пры 700—800 °С з парамі серы, фосфарам. Атрымліваюць з канцэнтратаў малібдэнавых руд (маюць 0,01—0,04% Р.). Выкарыстоўваюць пераважна на выраб плаціна-рэніевых каталізатараў для нафтаперапрацоўчай прам-сці (атрыманне бензіну з высокім актанавым лікам), а таксама дэталей электронных прылад, катодаў, тэрмапар, як матэрыял для эл. кантактаў і пакрыццяў, што ахоўваюць металы ад карозіі і зносу; сплавы Р. з інш. тугаплаўкімі металамі (вальфрам, малібдэн, тантал) як канстр. матэрыял у самалёта- і ракетабудаванні.

РЭНІ́Н, ферментатыўны *бялок*, які ўдзельнічае ва ўтварэнні рэчываў, што рэгулююць крывяны ціск, водна-салявы абмен і т-ру цела. Сінтэзуецца ў нырках, потым паступае ў кроў і лімфу. Каталізуе рэакцыю адшчаплення біялагічна неактыўнага пептыду ангіятэнзіну-1 ад α_2-глабуліну плазмы крыві (ангіятэнзінагену). Ангіятэнзін-1 пераўтвараецца ў ангіятэнзін-2, які валодае моцным сасудазвужальным дзеяннем, стымулюе сакрэцыю надніравечнікамі гармона *альдастэрону*. Утрыманне Р. ў крыві — адзін з крытэрыяў артэрыяльнай гіпертаніі, пры прагрэсіраванні якой узровень Р. ўзрастае. Зніжэнне актыўнасці Р.-ангіятэнзінавай сістэмы ў мозгу садзейнічае развіццю ліхаманкі, павелічэнне прыводзіць да зніжэння высокай т-ры цела. *І.М.Семяненя.*

«РЭНО́» (Renault S.A.), аўтамабільны канцэрн Францыі. Засн. ў 1895 прадпрымальнікам Л.Рэно. У 2-ю сусв. вайну прадпрыемствы канцэрна знішчаны больш чым на 80%. У 1945 нацыяналізаваны, з 1990 акц. т-ва. З 1979 супрацоўнічае з канцэрнам «*Вольва*», у 1993 абедзве фірмы аб'ядналіся пад назвай «Рэно-Вольва-Атаматыў». Спецыялізуецца на выпуску легкавых і грузавых аўтамабіляў тыпу «Рэно» розных мадыфікацый і цягнікоў. Штаб-кватэра ў г. Булонь-Біянкур.

«РЭНО́» (Renault), сям'я аўтамабіляў і аўтобусаў аднайм. франц. канцэрна. Легкавыя аўтамабілі выпускаюцца з 1898, грузавыя — з 1980. Большасць мадэлей легкавых аўтамабіляў пярэднепрывадныя, маюць бензінавыя рухавікі магутнасцю ад 40 да 123 кВт, найб. скорасць ад 150 да 250 км/гадз. Грузавыя аўтамабілі рознага прызначэння маюць рухавікі магутнасцю ад 36 да 390 кВт, поўную масу ад 1,31 да 40 т (аўтапаязды да 100 т). Пасажыраўмяшчальнасць аўтобусаў ад 17 да 165 чалавек.

РЭНО́ (Renault) Луі (21.5.1843, Атэн, Францыя — 8.2.1918), французскі юрыст. Скончыў Дыжонскі (1861) і Парыжскі (1868) ун-ты. Праф. міжнар. права Парыжскага ун-та (1881). З 1880 адначасова дырэктар франц. дыпламат. архіва, з 1890 кансультаваў міністэрства замежных спраў Францыі на міжнар. канферэнцыях. У якасці эксперта ўдзельнічаў у Гаагскіх міжнар. канферэнцыях 1899 і 1907, адзін з распрацоўшчыкаў *Гаагскіх канвенцый*. Чл. Міжнар. трэцейскага суда ў Гаазе. Нобелеўская прэмія міру 1907 (з Э.*Манетам*).

РЭ́НТА (ням. Rente, франц. rente ад лац. reddita вернутая), даход, які рэгулярна атрымліваюць з зямлі, капіталу, маёмасці (не звязаны з прадпрымальніцкай дзейнасцю). Можа быць атрымана ад здачы зямлі ці памяшканняў у *арэнду*, прадастаўлення *крэдыту* і інш. У адпаведнасці з Грамадз. кодэксам Рэспублікі Беларусь паводле дагавору атрымальнік Р. перадае плацельшчыку Р. пэўную маёмасць на ўмовах перыядычных выплат ім у выглядзе грашовых

1

2

3

Да арт. **«Рэно»**: 1 — легкавы аўтамабіль «Рэно-Меган»; 2 — фургон «Рэно-Месенджэр-В-120.45»; 3 — прычапны аўтапоезд з цягачом «Рэно-АЕ-Магнум».

адлічэнняў ці сродкаў у інш. формах. У выпадку адчужэння плацельшчыкам Р. маёмасці, перададзенай пад выплату Р., яго абавязацельствы пераходзяць да набытчыка гэтай маёмасці. Адрозніваюць Р. бестэрміновую (пастаянную) і пажыццёвую (на тэрмін жыцця атрымальніка). Пры б е с т э р м і н о в а й Р. атрымальнікамі яе могуць быць грамадзяне ці некамерцыйныя арг-цыі, якія выплачваюць Р. ў выглядзе грашовых адлічэнняў, устаноўленых дагаворам, ці рэчаў, выканання работ (паслуг), якія па вартасці адпавядаюць грашовай суме. П а ж ы ц ц ё в а я Р. ўстанаўліваецца на перыяд жыцця грамадзяніна, які перадае маёмасць плацельшчыку Р. Яе памер устанаўліваецца ў дагаворы, разлічваецца на месяц і павінен быць не меншы за мінімальную заработную плату (у асобных выпадках прадугледжваецца павелічэнне памеру Р.). Да Р. адносяць таксама *зямельную рэнту*; даход, які ўладальнік атрымлівае па аблігацыях дзярж. пазыкі (гл. *Рэнтавая пазыка*); грашовыя сумы, якія штогод выплачваюцца асобе па страхавым полісе з боку страхавога таварыства. *У.Р.Залатагораў.*

РЭНТА́БЕЛЬНАСЦЬ (ад ням. rentabel даходны, прыбытковы), эканамічны паказчык, які характарызуе ўзровень эфектыўнасці затрат і выкарыстання *рэсурсаў* у выніку вытв-сці і рэалізацыі прадукцыі. Вызначаецца ў працэнтах ці як каэфіцыент і выяўляе суадносіны паміж *прыбыткам* (звычайна чыстым) і затрачанымі сродкамі, выручкай ад рэалізацыі ці актывамі прадпрыемства (фірмы, кампаніі). У залежнасці ад мэты разліку вылучаюць Р.: асобных відаў прадукцыі, рэалізацыі, актываў, уласнага капіталу, інвестыцый. Р. а с о б н ы х в і д а ў п р а д у к ц ы і вызначае суадносіны паміж прыбыткам ад адзінкі прадукцыі і яе *сабекоштам*; разлічваецца пры вызначэнні цаны і ў аналіт. мэтах. Р. р э а л і з а ц ы і (*абароту*) вызначае суадносіны паміж прыбыткам ад рэалізацыі прадукцыі і выручкі ад рэалізацыі; характарызуе ўзровень прыбытку прадпрыемства ад пэўнага аб'ёму абароту. Для вызначэння ступені эфектыўнасці выкарыстання *капіталу* разлічваюць Р. а к т ы в а ў — суадносіны паміж прыбыткам і сукупнымі *актывамі*; Р. ч ы с т ы х а к т ы в а ў — суадносіны паміж прыбыткам і чыстым актывам; Р. б я г у ч ы х а к т ы в а ў — суадносіны паміж прыбыткам і бягучымі актывамі. Гэтыя паказчыкі вызначаюць аддачу, якая прыпадае на рубель адпаведных актываў; характарызуюць узровень канкурэнтаздольнасці прадпрыемства ў параўнанні з сярэднегаліновымі паказчыкамі. Узровень прыбытковасці прадпрыемства для акцыянераў вызначаюць пры дапамозе Р. ў л а с н а г а к а п і т а л у — суадносіны паміж прыбыткам і ўласным капіталам; характарызуе прыбытак, які прыпадае на рубель уласнага капіталу пасля выплаты працэнтаў за крэдыт і падаткаў (прыбытак, які знаходзіцца ў распараджэнні акцыянераў). Пры аналізе інвестыцыйных праектаў выкарыстоўваюць Р. і н в е с т ы ц ы й — суадносіны паміж даходамі і інвестыцыйнымі расходамі; характарызуе ўзровень прыбытку *інвестара* (фірмы), які прыпадае на рубель *інвестыцый*. *У.Р.Залатагораў.*

В.К.Рэнтген.

РЭ́НТАВАЯ ПАЗЫ́КА, від бестэрміновай аблігацыйнай *пазыкі дзяржаўнай*, пры якой дзяржава абавязваецца штогод выплачваць пэўны даход пазыкадаўцам — *рэнту*.

РЭ́НТАВЫЯ ПЛАЦЯЖЫ́, грашовыя адлічэнні юрыд. асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў у дзярж. бюджэт пры ажыццяўленні знешнегандлёвых тавараабменных (бартэрных) аперацый. Памер Р.п. залежыць ад агульнай вартасці пастаўленых у дзяржаву тавараў. На Беларусі спаганяецца 5% па бартэрных аперацыях, накіраваных на забеспячэнне ўласнай вытв-сці суб'ектаў гаспадарання (пастаўка сыравіны, матэрыялаў, абсталявання), і аперацыях, якія ажыццяўляюцца па рашэнні Савета Міністраў. Па астатніх бартэрных аперацыях Р.п. спаганяюцца ў памеры 15% ад агульнай вартасці пастаўленых тавараў.

РЭНТГЕ́Н, пазасістэмная адзінка экспазіцыйнай дозы рэнтгенаўскага і гама-выпрамянення, што вызначаецца па іанізавальным дзеянні выпрамяненняў на паветра. Абазначаецца Р. *Доза выпрамянення* ў 1 Р адпавядае ўтварэнню $2{,}083 \cdot 10^9$ пар іонаў у 1 $см^3$ паветра або $1{,}61 \cdot 10^{12}$ пар іонаў у 1 г паветра. 1 Р = $= 2{,}57978 \cdot 10^{-4}$ Кл/кг. Названа імем В.К.*Рэнтгена*.

РЭ́НТГЕН (Röntgen) Вільгельм Конрад (27.3.1845, г. Рэмшайд, Германія — 10.2.1923), нямецкі фізік. Чл.-кар. Берлінскай АН (1896). Вучыўся ў Вышэйшай тэхн. школе ў Цюрыху (1865—68), атрымаў ступень доктара ў Цюрыхскім ун-це (1868). Працаваў у розных ун-тах Германіі. У 1900—20 праф. Мюнхенскага ун-та і дырэктар Фіз. ін-та. Навук. працы па электрамагнетызме, фізіцы крышталёў, оптыцы і малекулярнай фізіцы. Выявіў магн. поле дыэлектрыка (1885), які рухаецца ў эл. полі (т.зв. рэнтгенаўскі ток), што мела важнае значэнне для стварэння электроннай тэорыі. Адкрыў рэнтгенаўскія прамяні

(1895) і даследаваў іх уласцівасці (гл. *Рэнтгенаўскае выпрамяненне*), прапанаваў канструкцыю трубкі для атрымання рэнтгенаўскіх прамянёў і зрабіў першыя рэнтгенаўскія фотаздымкі. Нобелеўская прэмія 1901 (першая сярод фізікаў).

Тв.: Рус. пер. — О новом виде лучей. М.; Л., 1933.

Літ.: Бобров Л.В. Тени невидимого света. М., 1964; Гернек Ф. Пионеры атомного века: Пер. с нем. М., 1974.

РЭНТГЕНАГРА́МА, зарэгістраваны на спец. фотаплёнцы (фотапласцінцы) відарыс аб'екта, што ўзнікае ў выніку ўзаемадзеяння яго з *рэнтгенаўскім выпрамяненнем*. Пры такім узаемадзеянні адбываецца паглынанне, адбіццё ці дыфракцыя рэнтгенаўскіх прамянёў. Прасторавае размеркаванне інтэнсіўнасці выпрамянення фіксуецца на фотаматэрыяле і адлюстроўвае будову аб'екта.

Абсарбцыйная Р. рэгіструе «цяняны» відарыс аб'екта, які ўзнікае з-за неаднолькавасці паглынання рэнтгенаўскага выпрамянення рознымі ўчасткамі аб'екта. Выкарыстоўваецца ў медыцыне, біялогіі, дэфектаскапіі і рэнтгенаўскай мікраскапіі. Дыфракцыйныя Р. атрымліваюць у рэнтгенаўскіх камерах і рэгіструюць дыфракцыйнае рассеянне выпрамянення крышт. ўзорамі (гл. *Дэбая—Шэррэра метад, Лаўэ метад*). Выкарыстоўваюцца для рашэння задач рэнтгеноструктурнага аналізу, рэнтгенаграфіі матэрыялаў, рэнтгенаўскай тапаграфіі.

РЭНТГЕНАГРАМАМЕТРЫ́Я, апрацоўка і аналіз рэнтгенаўскіх відарысаў электроннымі і вылічальнымі спосабамі; *метад рэнтгеналогіі*. З дапамогай вымярэння адлегласцей, вуглоў, плоскасцей, велічынь відарысаў павышаецца якасць дыягностыкі і павялічваецца распазнавальнасць паталаг. структур. Дае магчымасць раней распазнаваць паталаг. ўтварэнні, перадклінічныя праявы захворванняў, таксама атрымліваць відарысы з палепшанымі прасторава-частотнымі і градацыйнымі характарыстыкамі. *А.М.Міхайлаў.*

РЭНТГЕНАГРА́ФІЯ, гл. ў арт. *Рэнтгенадыягностыка*.

РЭНТГЕНАГРА́ФІЯ МАТЭРЫЯ́ЛАЎ, сукупнасць метадаў даследаванняў будовы крышталічных і аморфных рэчываў, заснаваных на вывучэнні дыфракцыі *рэнтгенаўскіх прамянёў*.

Для мэт Р.м. карыстаюцца ў асн. характарыстычным рэнтгенаўскім выпрамяненнем (гл. *Рэнтгенаўская спектраскапія*); дыфракцыйныя карціны рэгіструюцца фатагр. метадам (гл. *Рэнтгенаграма*) або з дапамогай лічыльнікаў іанізавальных выпрамяненняў. Рэнтгенаграфічнымі метадамі даследуюць узоры пры іх награванні і ахаладжэнні, ва ўмовах вакууму і высокага ціску, раўнаважныя і нераўнаважныя станы матэрыялаў, вывучаюць іх структуру, фазавы састаў і яго змены, будуюць фазавыя дыяграмы, даследуюць станы дэфармаваных (ці падвергнутых інш. уздзеянням) матэрыялаў, працэсы ўпарадкавання з'явы бліжэйшага парадку. Гл. таксама *Дэбая—Шэррэра метад, Лаўэ метад*.

РЭНТГЕНАДЫЯГНО́СТЫКА, распазнаванне пашкоджанняў і захворванняў розных органаў і сістэм чалавека пры рэнтгеналагічных даследаваннях; частка *рэнтгеналогіі*. Грунтуецца на ўласцівасці рэнтгенаўскіх прамянёў пранікаць праз непразрыстыя для светлавых прамянёў целы. Метады Р. — рэнтгеноскапія, рэнтгенаграфія (або іх спалучэнне).

Рэнтгеноскапія — прасвечванне, пры якім адлюстраванне аб'екта трапляе на флюарэсцэнтны экран або экран тэлевізара. Выкарыстоўваюць таксама лічбавыя рэнтгенаўскія апараты (адлюстраванне паступае на аналага-лічбавы пераўтваральнік, дзе эл. сігналы, якія нясуць інфармацыю пра аб'ект даследавання, пераўтвараюцца ў лічбавыя параметры). Рэнтгеноскапія дазваляе атрымліваць адлюстраванне любой ч. цела і большасці органаў і тканак. Рэнтгенаграфія — атрыманне здымка (негатыву) на рэнтгенаўскай плёнцы. Адрозніваюць рэнтгенаграфію традыц. і лічбавую. На лічбавых рэнтгенаўскіх апаратах адлюстраванне можа фіксавацца не толькі на плёнцы, а таксама на паперы, у магнітнай або магнітна-аптычнай памяці. Лічбавая рэнтгенаграфія дае высокую якасць адлюстравання, мае паніжаную прамянёвую нагрузку. Асн. клінічным патрабаваннем да рэнтгенаўскага адлюстравання з'яўляецца яго інфарматыўнасць. *А.М.Міхайлаў.*

РЭНТГЕНАКІМАГРА́ФІЯ (ад *рэнтген-* + грэч. kyma хваля + ... *графія*) рэнтгеналагічны метад даследавання, які дазваляе рэгістраваць на рэнтгенаўскай плёнцы рухі органаў (сэрца, вял. сасудаў, страўніка, дыяфрагмы і інш.). Робіцца пры дыягностыцы некат. захворванняў, напр., анеўрызмы аорты, інфаркту міякарда і інш.

РЭНТГЕНАЛО́ГІЯ медыцынская, галіна клінічнай медыцыны, якая вывучае выкарыстанне *рэнтгенаўскага выпрамянення* для даследавання будовы і функцыі органаў і сістэм, дыягностыкі хвароб чалавека і жывёл. Дае магчымасць вывучаць дзейнасць розных органаў, сачыць за дынамікай паталаг. працэсаў, выяўляць раннія формы захворванняў, якія працякаюць скрыта (напр., пухліны) і інш. Узнікла пасля адкрыцця рэнтгенаўскіх прамянёў (1895). Асн. раздзелы — *рэнтгенадыягностыка* (распрацоўвае пытанні распазнавання пашкоджанняў і захворванняў розных органаў), мед. рэнтгенатэхніка (рэнтгенаўская апаратура); таксама ваенна-палявая Р. (арганізацыя, тэхн. аснашчэнне, методыкі рэнтгеналагічнага даследавання хворых у палявых умовах). У Р. выкарыстоўваецца лічбавая апрацоўка рэнтгенаўскіх відарысаў (гл. *Рэнтгенаграмаметрыя*).

РЭНТГЕНАМЕ́ТРЫЯ, раздзел *дазіметрыі*, які вывучае метады вымярэння і разліку *дозы* рэнтгенаўскага і гама-выпрамянення, а таксама ўздзеянне гэтых выпрамяненняў на жывыя арганізмы. Вымярэнні праводзяцца з дапамогай *дазіметрычных прылад*. Гл. таксама *Біялагічнае дзеянне іанізавальных выпрамяненняў*.

РЭНТГЕНАСКАПІ́Я, гл. ў арт. *Рэнтгенадыягностыка*.

РЭНТГЕНАСТРУКТУ́РНЫ АНА́ЛІЗ, рэнтгенаўскі структурны аналіз, сукупнасць метадаў даследавання атамнай структуры рэчыва з дапамогай дыфракцыі рэнтгенаўскіх прамянёў. Па дыфракцыйнай карціне вызначаюць размеркаванне электроннай шчыльнасці рэчыва, а па ёй — род атамаў і іх узаемнае размяшчэнне.

Для крышталічных матэрыялаў Р.а. дазваляе ўстанавіць каардынаты атамаў з дакладнасцю 0,01—0,1 нм, вызначыць характарыстыкі іх цеплавых ваганняў. Дыфракцыйная карціна залежыць ад атамнай будовы даследнага аб'екта, характару і даўжыні хвалі рэнтгенаўскага выпрамянення. Найб. распаўсюджаныя метады Р.а. — *Лаўэ метад, Дэбая—Шэррэра метад*. З дапамогай Р.а. даследуюцца структуры крышталёў, вадкасцей, бялковых малекул, вырашаюцца пытанні фізікі цвёрдага цела: прэцызійнае вызначэнне формы і памераў элементарнай ячэйкі, вывучэнне тэкстуры матэрыялаў, вызначэнне фазавага складу рэчываў па размяшчэнні і інтэнсіўнасцях ліній на рэнтгенаграмах і інш. *А.У.Шэлег.*

РЭНТГЕНАТЭРАПІ́Я, метад *прамянёвай тэрапіі*, заснаваны на выкарыстанні *рэнтгенаўскага выпрамянення*. Ажыццяўляецца з дапамогай спец. мед. рэнтгенатэрапеўт. апаратаў. Прыгнечвае жыццядзейнасць клетак паталагічна зменených тканак або цалкам іх разбурае. Пры непухлінных захворваннях Р. накіравана на спыненне запаленчай рэакцыі, зніжэнне болевай адчувальнасці і сакраторнай актыўнасці залоз. Адрозніваюць Р. глыбокую (уздзеянне на органы і тканкі, размешчаныя ў глыбіні цела), мясцовую (асобнага органа або абмежаванага ўчастка цела), агульную (усяго цела). Пашырана пры лячэнні захворванняў скуры, слізістых абалонак і інш. Часам спалучаецца з антыбактэрыяльнай тэрапіяй і інш. метадамі.

РЭНТГЕ́НАЎСКАЕ ВЫПРАМЯНЕ́ННЕ, рэнтгенаўскія прамяні, электрамагнітнае іанізавальнае *выпрамяненне* са спектральнай вобласцю паміж гама- і ультрафіялетавым выпрамяненнем. Даўж. хвалі ад 10^{-8} да 10^{-11} м. Умоўна падзяляецца на жорсткае (даўж. хвалі менш за $2 \cdot 10^{-10}$ м) і мяккае (больш за $2 \cdot 10^{-10}$ м). Адкрыта В.К.*Рэнтгенам* (1895).

Натуральнымі крыніцамі Р.в. з'яўляюцца Сонца і інш. касм. аб'екты (гл. *Рэнтгенаўская астраномія*). Штучныя крыніцы — *рэнтгенаўская трубка* (найб. пашырана), некаторыя радыеактыўныя ізатопы, сінхратроны і назапашвальнікі электронаў (мяккае Р.в.). *Рэнтгенаўскі спектр* бывае неперарыўным (тармазным; гл. *Тармазное выпрамяненне*) і лінейчастым (характарыстычным; гл. *Мозлі закон*), які атрымліваецца ў выніку іанізацыі атама з выбіваннем электрона з яго ўнутр. абалонак (першаснае Р.в.) ці пры паглынанні кванта эл.-магн. выпрамянення (флуарэсцэнтнае Р.в.). Пры ўзаемадзеянні Р.в. з рэчывам назіраецца *фотаэфект*, які суправаджаае паглынанне, а таксама рассеянне Р.в. Фотаэфект узнікае, калі атам рэчыва пасля паглынання кванта Р.в. вылучае адзін з унутр. электронаў і адбываецца выпрамяняльны пераход (характарыстычнае выпрамяненне) або дадаткова вылучае электрон (ажэ-электрон) пры безвыпрамяняльным пераходзе. Рассеянне Р.в. ў вобласці вял. атамных мас і даўжынь хваль у асн. кагерэнтнае (без змены даўжыні хвалі); у вобласці малых атамных мас і даўжынь хваль — комптанаўскае (гл. *Комптана эфект*) ці камбінацыйнае. Рэгіструюць Р.в. з дапамогай спец. фотаматэрыялаў (гл. *Рэнтгенаграма*), а

таксама *дэтэктараў іанізавальных выпрамяненняў*. Выкарыстоўваецца ў медыцыне для рэнтгенадыягностыкі і рэнтгенатэрапіі, рэнтгеналагічным аналізе, рэнтгенаўскіх спектральным аналізе, тапаграфіі, спектраскапіі, астраноміі.

Літ.: Блохин М.А. Физика рентгеновских лучей. 2 изд. М., 1957; Рентгеновские лучи: Пер. с нем. и англ. М., 1960.

М.М.Аляхновіч.

РЭНТГЕ́НАЎСКАЯ АСТРАНО́МІЯ, раздзел *пазаатмасфернай астраноміі*, які вывучае крыніцы касм. рэнтгенаўскага выпрамянення з даўжынёй хвалі 0,01—10 нм.

Для даследавання касм. рэнтгенаўскага выпрамянення апаратуру выводзяць пры дапамозе касм. апаратаў за межы атмасферы Зямлі. Упершыню назіралася рэнтгенаўскае выпрамяненне Сонца ў 1948. Яго крыніцы — *сонечная карона* і *храмасфера* (рэнтгенаўская свяцільнасць Сонца — да 10^{-6}—10^{-7} поўнай яго свяцільнасці). За межамі Сонечнай сістэмы рэнтгенаўскае выпрамяненне назіраецца з 1962. Крыніцы касм. рэнтгенаўскага выпрамянення (больш як 10^3) падзяляюцца на галактычныя і пазагалактычныя. Невял. частка галактычных крыніц атаясамліваецца з аптычнымі і радыёаб'ектамі. Сярод іх: рэшткі ўспышак *звышновых зорак, падвойныя зоркі*, адным з кампанентаў якіх з'яўляецца кампактны аб'ект — белы *карлік, нейтронная зорка, чорная дзіра* і інш. Пазагалактычныя крыніцы — некаторыя нармальныя *галактыкі*, скопішчы галактык, цэнтр. вобласці галактык, у якіх звышмасіўныя чорныя дзіры паглынаюць навакольны газ, *радыёгалактыкі, квазары* і інш.

Літ.: Лонгейр М.С. Астрофизика высоких энергий: Пер. с англ. М., 1984.

А.А.Шымбалёў.

РЭНТГЕ́НАЎСКАЯ КА́МЕРА, прылада для даследавання і кантролю атамнай структуры пры дапамозе *дыфракцыі рэнтгенаўскіх прамянёў* на доследным узоры.

Бываюць рознай канструкцыі: Маюць крыніцу выпрамянення (*рэнтгенаўскую трубку*), каліматар (фарміруе рабочы пучок першаснага выпрамянення), вузел установкі доследнага ўзору, касету з фотаплёнкай, на якой рэгіструецца дыфракцыйная карціна, і механізм руху ўзору (ці касеты) і інш. Выкарыстоўваюцца ў рэнтгенаўскім структурным аналізе, рэнтгенаграфіі матэрыялаў, рэнтгенаўскай тапаграфіі.

РЭНТГЕ́НАЎСКАЯ СПЕКТРАСКАПІ́Я, сукупнасць метадаў даследавання атамнай структуры па рэнтгенаўскіх спектрах выпрамянення і паглынання. Для атрымання рэнтгенаўскіх спектраў доследнае рэчыва бамбардзіруюць электронамі ў *рэнтгенаўскай трубцы* або ўзбуджаюць яго флуарэсцэнцыю пад дзеяннем *рэнтгенаўскага выпрамянення*.

Рэнтгенаўскія спектры выпрамянення даследуюць па залежнасці інтэнсіўнасці выпрамянення ад энергіі фатона, спектры паглынання — па залежнасці масавага каэфіцыента паглынання ад энергіі ўзбуджэння. Метады Р.с. выкарыстоўваюцца для вызначэння зараду іонаў у малекулах газаў, вадкасцей і цвёрдых цел; вывучэння размеркавання валентных электронаў і свабодных дазволеных станаў па энергіях, шырыні размеркавання Фермі ў металах і сплавах і інш.

А.Р.Дутаў.

РЭНТГЕ́НАЎСКАЯ ТРУ́БКА, электравакуумная прылада для атрымання *рэнтгенаўскіх прамянёў*. Інтэнсіўнасць рэнтгенаўскага выпрамянення залежыць ад напружання, прыкладзенага да электраду, току, а таксама матэрыялу анода. Мае катод і анод. Электроны, што вылучае катод, паскараюцца моцным эл. полем і бамбардзіруюць анод. Пры ўдарах электронаў аб анод іх кінетычная энергія пераўтвараецца ў энергію рэнтгенаўскага выпрамянення (часткова — у цеплавую энергію).

Паводле спосабу атрымання электроннага патоку Р.т. падзяляюцца на электронныя (электроны генерыруюцца за кошт *тэрмаэлектроннай эмісіі* катода) і іонныя (электроны выбіваюцца з халоднага катода дадатнымі іонамі). Выкарыстоўваюцца ў медыцыне, дэфектаскапіі, навук. даследаваннях.

РЭНТГЕ́НАЎСКІЯ ПРАМЯНІ́, электрамагнітнае выпрамяненне з даўжынёй хвалі ад 10^{-8} да 10^{-11} м. Адкрыты ў 1895 В.К.*Рэнтгенам*, які назваў іх Х-прамянямі. Гл. таксама *Рэнтгенаўскае выпрамяненне*.

РЭНТГЕНАЭЛЕКТРО́ННАЯ СПЕКТРАСКАПІ́Я, сукупнасць метадаў вызначэння будовы хім. злучэнняў і структуры паверхні цвёрдых цел на аснове аналізу фотаэлектронаў рэчыва пад уздзеяннем рэнтгенаўскага выпрамянення.



Да арт. **Рэнтгенаўская камера**. Схема дэбаеўскай камеры: 1 — каліматар; 2 — фотаплёнка; 3 — касета; 4 — механізм цэнтроўкі ўзору; 5 — узор; 6 — пастка для перахоплівання першаснага пучка.

Рэнтгенаўская трубка.

Спектры фотаэлектронаў атрымліваюць з дапамогай магнітных, безжалезных бэта-спектрометраў у вобласці энергій 2—10 кэВ. Метад эфектыўны ў даследаваннях цвердафазавых рэакцый, дэфектнага складу рэчыва, хіміі тонкіх плёнак, паколькі ў выпрамяненні электронаў удзельнічае толькі паверхневы слой узору. Выкарыстоўваюць для вызначэння энергіі атамных узроўняў, валентнага стану атамаў у хім. злучэнні, для хім. і фазавага аналізаў.

Літ.: Миначев Х.М., Антошин Г.В., Шпиро Е.С. Фотоэлектронная спектроскопия и ее применение в катализе. М., 1981; Нефедов В.И. Рентгеноэлектронная спектроскопия химических соединений: Справ. М., 1984.

А.Р.Дутаў.

РЭНУА́Р (Renoir) Жан (15.9.1894, Парыж — 12.2.1979), французскі кінарэжысёр. Сын А.*Рэнуара*. З 1924 у кіно (у 1941—51 у Галівудзе). Найб. значны фільм — «Вялікая ілюзія» (1937, прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Венецыі) пра падзеі 1-й сусв. вайны. Сярод інш. фільмаў: «Марсельеза» і «Чалавек-звер» (абодва 1938), «Правілы гульні» (1939), «Французскі канкан» (1956), «Сненанне на траве» (1959), «Маленькі тэатр Жана Рэнуара» (тэлефільм, 1969). Для яго творчасці характэрна спалучэнне жыццёвай праўдападобнасці з паэт. успрыняццем свету і тэатр. пачаткам; у выяўл. і колеравых рашэннях арыентаваўся на традыцыі імпрэсіянісцкага жывапісу. Аўтар кнігі пра свайго бацьку (1962), аўтабіягр. кн. «Маё жыццё і мае фільмы» (1974). Спец. прэмія «Оскар» 1975.

Тв.: Рус. пер. — Моя жизнь и мои фильмы., М., 1981.

Літ.: Лепроон П. Современные французские кинорежиссеры: Пер. с фр. М., 1960; Жан Ренуар: Статьи. Интервью. Воспоминания. Сценарий: Пер. с фр. М., 1972.

РЭНУА́Р (Renoir) П'ер Агюст (25.2.1841, г. Ліможа, Францыя — 17.12.1919), французскі жывапісец, графік, скульптар; адзін з заснавальнікаў *імпрэсіянізму*. З 1845 жыў у Парыжы. У 1854—58 працаваў у майстэрні па размалёўцы фарфору і адначасова займаўся ў Школе малюнка і дэкар. мастацтваў. У 1862—64 вучыўся ў Школе прыгожых мастацтваў у майстэрні Ш.Глейра, дзе зблізіўся з К.Манэ, А.Сіслеем. У ранніх творах зазнаў уплыў Г.Курбэ («Карчма матухны Антоні», 1866; «Дыяна», 1877). На мяжы 1860—70-х г. перайшоў да



А.Рэнуар.

жывапісу на пленэры, апрабоўваў метад перадачы вібруемай святло-паветранай прасторы ў пейзажы; выпрацаваныя прынцыпы перанёс і на выявы людзей («Купанне на Сене», 1869). Паступова яго пісьмо станавілася празрыстым, палітра больш светлай, каларыт насычаўся тонкімі рэфлексамі, мяккімі кантрастамі цёплых па тоне ценяў і багатых серабрыста-жамчужнымі адценнямі асветленых зон («Ложа», 1874). Пры выяўленні бытавых, нібыта выпадковых эпізодаў і жыццёвых сітуацый, Р. аддаваў перавагу святочным сцэнам гар. жыцця — балям, танцам, прагулкам («Мулен дэ ла Галет», 1876; «Танец у Бужэвалі», 1883). Асаблівае месца ў яго творчасці займаюць паэт. і абаяльныя вобразы жанчын («Пасля абеду», «Парасонікі», 1879; «Мадэмуазель Грымпель з блакітнай стужкай», 1880; партрэт актрысы Жанны Самары, 1877). У выяўленні аголенай натуры ён дасягнуў рэдкай вытанчанасці карнацый, пабудаваных на спалучэнні цёплых цялесных тонаў з лёгкімі зеленаватымі і шэраблакітнымі рэфлексамі, што надаюць гладкасць і матавасць паверхні палатна («Аголеная жанчына сядзіць на кушэтцы», 1876). Як выдатны каларыст часта дасягаў уяўлення манахромнасці жывапісу з дапамогай найтанчэйшых спалучэнняў блізкіх па колеры тонаў («Дзяўчаты ў чорным», 1883). З 1880-х г. усё больш імкнуўся да класічнай яскравасці і абагульненасці форм, жывапісу ўласцівы рысы дэкаратыўнасці і ідылічнасці («Вялікія купальшчыцы», 1884—87). Лаканізм, лёгкасць і паветранасць штрыха ўласцівы шматлікім малюнкам і афортам. Аўтар скульптур «Венера-пераможца», «Суд Парыса» і інш. Іл. гл. таксама да арт. *Імпрэсіянізм*.

Літ.: Вельчинская И. Ренуар: [Альбом]. М., 1970; Перрюшо А. Жизнь Ренуара: Пер. с фр. М., 1979. *Т.В.Пешына.*

РЭНЬЕ́ (Régnier) Анры Франсуа Жазеф дэ (28.12.1864, г. Анфлёр, Францыя — 23.5.1936), французскі пісьменнік. Чл. Франц. акадэміі (з 1911). Па адукацыі юрыст. Дэбютаваў як паэт. У вершах спалучаў сімвалісцкія пошукі з дакладнасцю і пластычнасцю вобраза паэтаў-парнасцаў. У лірычных зб-ках «Будучыя дні» (1885), «Гульні вяскоўцаў і багоў» (1897), «Гліняныя медалі» (1900) і інш. апявае чароўнасць усяго нетрывалага і крохкага, ухваляе пачуццёвыя асалоды і ўсякія радасці. Аўтар раманаў «Двойчы каханая» (1900), «Канікулы сціплага маладога чалавека» (1903), «Жывое мінулае» (1905), «Гераічныя ілюзіі Тыта Басі» (1916), «Грэшніца» (1920), «Правінцыяльныя забавы» (1925), «Я, яна і ён» (1935), зб-каў апавяд. «Яшмавы кій» (1897), «Лакавы паднос» (1913), «Згубленае шчасце» (1924) і інш. На бел. мову яго асобныя апавяданні пераклаў А.Асташонак.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Французская навела XX ст. Мн., 1992; Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—7. М., 1992—93. *А.В.Хадановіч.*

А.Рэнуар. Партрэт актрысы Жанны Самары. 1877.

РЭНЬЕ́ (Régnier) Жан Луі Эбензер (1771—1814), французскі ваенны дзеяч. Ген. дывізіі, граф. У арміі з 1792. У *вайну 1812* камандаваў 7-м саксонскім корпусам «Вялікай арміі». У пач. ліп. 1812 яго корпус вылучаны са складу групы Жэрома Банапарта для дзеянняў у якасці заслону супраць войск 3-й Зах. рус. арміі. 27 ліп. корпус пацярпеў паражэнне ў *Кобрынскім баі 1812* і адступіў да Слоніма. 12.8.1812 Р. разам з аўстрыйскім (12-м) корпусам К.Шварцэнберга атрымаў перамогу ў *Гарадзечанскай бітве 1812* і ўдзельнічаў у праследаванні рус. войск да Луцка. Восенню 1812 корпус Р. прыкрываў тыл аўстр. войск ад 3-й Зах. рус. арміі. 15—16 ліст. ў Ваўкавыскім баі 1812 і 25 ліст. ў баі каля Брэст-Літоўска разбіў ахоўныя сілы 3-й Зах. арміі — вайск. групу Ф.В.Остэн-Сакена і прымусіў яе адступіць на Валынь. У час Лейпцыгскай бітвы 1813 трапіў у палон. *А.М.Лукашэвіч.*

РЭ́ПА (Brassica rapa), кветкавая расліна сям. крыжакветных. 5 падвідаў. На Пд Еўропы і ў Зах. Азіі як пустазелле пашырана Р. дзікая. У Еўропе, Азіі і Паўн. Амерыцы як агароднінная культура вырошчваецца Р. еўрапейская, або культурная, вядомая народам стараж. Шумера, Вавілона і Асірыі. На Беларусі — з 11 ст.; да паяўлення бульбы была адной з асн. харч. культур. Культывуюцца сталовыя (Майская белая, Міланская, Пятроўская 1 і інш.) і кармавыя (*турнэпс*) сарты.

Двухгадовая травяністая расліна з белым, жаўтаватым ці фіялетавым караняплодам. У год пасеву развівае разетку буйнога ліраподобна рассечанага ліся і караняплод, на другі — кветаносныя парасткі. Кветкі жоўтыя, духмяныя, у гронкападобных суквецціях. Плод — стручок. Караняплоды маюць цукар (3,8—6,4%), аскарбінавую к-ту (21—35%), вітаміны групы В, калій. Іх спажываюць свежымі, варанымі, смажанымі. Бацвінне ідзе на корм жывёле. Харч., лек., кармавая расліна. *В.М.Прохараў.*

РЭПАРА́ЦЫІ (ад лац. reparatio аднаўленне), адна з форм матэрыяльнай адказнасці суб'екта міжнар. права за шкоду, прычыненую ім інш. суб'екту міжнар. права ў выніку міжнар. правапарушэння. Выплата Р. можа рабіцца натурай, у выглядзе грашовай або інш. матэрыяльнай кампенсацыі або адначасова *рэстытуцыі* і кампенсацыі шкоды. Р.



Сарты **рэпы**: 1— Пятроўская; 2— Карэльская; 3— Міланская

адрозніваюць ад *кантрыбуцыі* — даніны пераможцу ў вайне, якая існавала на практыцы да 1919. Напр., у Версальскім мірным дагаворы 1919 ужо гаворыцца толькі пра Р. як форму кампенсацыі шкоды, нанесенай Германіяй і яе саюзнікамі ў ходзе 1-й сусв. вайны 1914—18. У адпаведнасці з сучасным міжнар. правам прынцыпова важнае значэнне мае матэрыяльная адказнасць дзяржавы за развязванне ёю агрэсіўнай вайны, г. зн. ваенная Р. Так, у рашэннях Крымскай (Ялцінскай) канферэнцыі 1945 і Берлінскай (Патсдамскай) канферэнцыі 1945 прадугледжвалася выплата Р. Германіяй, а ў мірных дагаворах 1947 — выплата Р. дзяржавамі — былымі саюзнікамі Германіі ў 2-й сусв. вайне.

РЭПАРТА́Ж (франц. reportage ад англ. report паведамляць), аператыўнае паведамленне пра з'яву, падзею, здарэнне, сведкам ці ўдзельнікам якіх быў рэпарцёр; адзін з інфарм. жанраў журналістыкі. У залежнасці ад сродкаў масавай інфармацыі (друк, радыё, тэлебачанне) Р. мае асаблівасці. У прэсе адрозніваюцца Р. падзейны (падрабязнае апісанне падзеі), тэматычны (апісваюцца падзеі, што адбываліся ў розныя часы, але аб'яднаны адной тэмай), фотарэпартаж (здымкі са сцісламі тэкставай інфармацыяй). Радыёрэпартаж вызначаецца паслядоўнасцю ў выкладанні падзей. Тэлерэпартаж часта перарастае ў каменціраванне падзей (гл. *Каментарый*). Кінарэпартаж — фіксацыя на кінаплёнку інфармацыі з месца падзей (гл. *Дакументальнае кіно*). Рэпартажныя кіназдымкі падзяляюцца на падзейныя, тэматычныя, праблематычныя.

Р. ўласцівы элементы аналізу, абагульненняў, разважання і ацэнкі фактаў. У Р. няма месца вымыслу, таму што гал. крыніцы збору інфармацыі — запісы, дакументы, *інтэрв'ю*, асабістыя назіранні аўтара. У Р. асвятляюцца аб'ектыўныя з'явы праз непасрэднае аўтарскае адлюстраванне (што ўбачыў, пачуў, якія вывады зрабіў), таму ён мае суб'ектыўнае адценне. Адметнасць Р. ў тым, што дасягаецца эфект прысутнасці чытача ці гледача на месцы дзеяння. Словы «Р.» і «з месца падзеі» з'яўляюцца сінонімамі ў сэнсавых адносінах.

Т.У.Люковіч.

РЭПАРТЫМ'Е́НТА (ад ісп. repartimiento размеркаванне), тэрмін, які ў ісп. калоніях Лац. Амерыкі з канца 15 ст. абазначаў размеркаванне паміж іспанцамі зямель, ваен. здабычы, тавараў і г.д. Найб. часта ўжываўся як назва прымусовай працоўнай павіннасці індзейцаў, паводле якой прыватныя асобы з іспанцаў мелі права з дазволу калан. адміністрацыі браць штогод у *энкам'енду* вызначаную колькасць індзейцаў пэўнага раёна для працы на плантацыях, у рудніках і інш. Гэта было прычынай масавай смяротнасці і хуткага скарачэння індзейскага насельніцтва.

РЭПАТРЫЯ́ЦЫЯ (ад позналац. repatriatio вяртанне на радзіму), вяртанне ў краіну паходжання ці грамадзянства асоб, якія апынуліся па-за яе межамі ў выніку розных сац.-эканам. і паліт. абставін з аднаўленнем у правах грамадзянства. Р. ажыццяўляецца звычайна на аснове міжнар. дагавораў. У пазадагаворным выпадку яе магчымасць павінна прадугледжвацца законамі зацікаўленай дзяржавы. Р., звязаная са зменай (набыццём) грамадзянства, можа быць разнавіднасцю *аптацыі*. Асабліва шырокія маштабы Р. набыла ў першыя гады пасля 2-й сусв. вайны.

На Беларусі першы значны працэс Р. адбываўся пасля заканчэння 1-й сусв. вайны, калі на радзіму (у БССР і Зах. Беларусь) вярнулася каля мільёна бежанцаў і ваеннапалонных; толькі ў Зах. Беларусь у 1919—24 вярнулася каля 700 тыс. беларусаў. У 1920-я г. Р. ажыццяўлялася таксама ў форме рээмігрpreцыі прадстаўнікоў бел. паліт. эміграцыі, якія вярталіся ў БССР у сувязі з амністыяй, абвешчанай у 1923. Пасля 2-й сусв. вайны ў БССР разгортвалася 2-я шырокая хваля Р. З эвакуіраваных у пач. Вял. Айч. вайны ва ўсх. раёны СССР каля 1,5 млн. чал. толькі кожны 3-і вярнуўся на Беларусь. Да канца Вял. Айч. вайны на тэр. Германіі і яе саюзнікаў знаходзілася 10 181 тыс. грамадзян СССР, у т.л. 5 662 тыс. мірнага насельніцтва і 4 552 тыс. ваеннапалонных. З Беларусі ў гады вайны было вывезена на прымусовую працу ў Германію каля 399 тыс. чал. На пач. 1946 з іх вярнулася на радзіму каля 200 тыс. чал. У кастр. 1944 пры СНК СССР створана Цэнтр. ўпраўленне па справах Р.; аддзелы Р. існавалі пры СНК РСФСР, Украіны, Беларусі, Малдавіі, Эстоніі, Літвы і Латвіі. Сав. ўрад быў зацікаўлены ў найб. поўнай і хутчэйшай Р. сваіх грамадзян, як па эканам., так і па палітыка-ідэалаг. прычынах. Пераважная большасць сав. перамешчаных асоб шчыра жадалі вяртання ў СССР. 22.5.1945 прадстаўнікі ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі падпісалі прапанаваны сав. урадам дакумент, які замацоўваў прынцыпы абавязковай Р. сав. грамадзян. У сав. зоне акупацыі Германіі ў выніку агітацыі і прымусу Р. ажыццяўлялася фарсіраванымі тэмпамі. У лагерах для бежанцаў і перамешчаных асоб у зонах акупацыі зах. саюзнікаў працавалі сав. рэпатрыяцыйныя місіі з супрацоўнікаў дзяржбяспекі, у выніку чаго частка бежанцаў насуперак уласнай волі накіроўвалася ў лагеры сав. зоны. На 1.3.1946 рэпатрыіравана 4 199 тыс. сав. грамадзян, у т.л. 520 672 беларусы (385 896 цывільных і 134 776 ваеннапалонных). Да іх варта дадаць і 241 тыс. т.зв. унутрана перамешчаных асоб (асобы, якія не былі за мяжой і перамяшчаліся ўнутры СССР). У 1946—52 у СССР вярнуліся яшчэ 104 893 рэпатрыянты. Большасць з іх вернута з краін, дзе знаходзіліся сав. войскі. Паводле Указа Прэзідыума Вярх. Савета СССР ад 14.6.1946 «Аб аднаўленні ў грамадзянстве СССР падданых былой Расійскай імперыі, а таксама асоб, якія страцілі савецкае грамадзянства» і інш. прававых актаў 1945—47, беларусы і ўкраінцы, што жылі на тэр. даваен. Польшчы, атрымалі права на набыццё сав. грамадзянства, і тысячы выхадцаў з Беларусі прынялі яго. Асн. маса рэпатрыянтаў праходзіла праверку і фільтрацыю ў франтавых і армейскіх лагерах, зборна-перасыльных пунктах Наркамата абароны, праверачна-фільтрацыйных пунктах (ПФП) НКУС. Выяўленыя злачынныя элементы і падазроныя асобы накіроўваліся для больш сур'ёзнай праверкі ў спец. лагеры НКУС і папраўча-працоўныя лагеры ГУЛАГа. У 1944—45 праз ПФП прайшлі 230 635 украінцаў, 155 499 рускіх, 81 846 беларусаў, 28 727 малдаван, а таксама прадстаўнікі інш. нацыянальнасцей. Мясц. органы НКУС—НКДБ праводзілі праверку рэпатрыянтаў, якія прыбывалі да месца жыхарства. На 20.11.1945 у Беларусі было арыштавана 1112 рэпатрыянтаў. Перыяд масавай Р. завяршыўся ў 1946. У наступныя гады яна рэзка пайшла на спад. Паводле нац. складу рэпатрыянтаў 1949—50 было: украінцаў 33,4%, рускіх 28,4%, малдаван 5,2%, беларусаў 5%, літоўцаў 5%, латышоў 3%. Да 1952 па лініі органаў Р. ў СССР вярнулася больш за 4,3 млн. сав. грамадзян. Агульная колькасць сав. грамадзян, якія ў выніку вайны апынуліся за мяжой і потым вярнуліся ў СССР, ацэньваецца ў 4,5 млн. чал. Акрамя гэтага, на чэрв. 1948 у СССР рэпатрыіравалася 106 835 чал., якія самі ці іх продкі эмігрыравалі з царскай або сав. Расіі. 2710 такіх рээмігрантаў з Францыі было расселена на Беларусі. На сак. 1949 спец. 6-гадовае пасяленне адбывалі 5432 беларусы, што служылі ў гады вайны ў Рус. вызв. арміі Уласава, нац. легіёнах, паліцыі. У 1944—48 у выніку падпісання пагаднення паміж урадам БССР і Польскім к-там нац. вызвалення ад 9.9.1944 аб эвакуацыі бел. насельніцтва з тэр. Польшчы і польскіх грамадзян з тэр. БССР адбылася ўзаемная Р. жыхароў Беларусі і Польшчы. У гэты час 36 тыс. беларусаў пераехалі ў БССР, 274 тыс. асоб, якія запісаліся палякамі, перасяліліся ў Польшчу. У 1950—60-я г. Р. адбывалася ў форме невял. рээміграцыі з зах. краін. У 1953—55 з Францыі і Аргенціны вярнулася каля 200 беларусаў. Да 1964 прыбыло каля 10—15 тыс. аргенцінскіх беларусаў, аднак пазней амаль палова з іх зноў пакінула Беларусь, расчараваная ў рэчаіснасці сав. грамадства. Пасля распаду СССР (снеж. 1991) і стварэння новых незалежных дзяржаў, у якіх апынулася 2130 тыс. беларусаў, частка з іх вярнулася на Беларусь. Гл. таксама *Бежанцы, Дыяспара*.

Літ.: Снапкоўскі У.Е. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі, 1944—1953 гг. Мн., 1997; Земсков В.Н. Репатриация советских граждан и их дальнейшая судьба (1944—1956 гг.) // Социол. исслед. 1995. № 5—6.

У.Е.Снапкоўскі.

РЭПАТРЫЯ́ЦЫЯ КАПІ́ТАЛАЎ, вяртанне капіталаў, якія былі ўкладзены за мяжой, для інвестыцый унутры сваёй краіны. Рэпатрыяцыя пазык, якія былі размешчаны сярод замежных пазыка-

трымальнікаў, адбываецца шляхам выкупу дзяржавай-эмітэнтам або яе грамадзянамі сваіх аблігацый.

РЭПЕЛЕ́НТЫ [ад лац. repellens (repelentis) які адпіхвае, адганяе], хімічныя прэпараты або рэчывы з групы *пестыцыдаў* для адпужвання насякомых, кляшчоў, птушак, грызуноў, для абароны людзей і жывёлы ад нападу насякомых крывасмокаў, аховы с.-г. раслін і насення ад шкоднікаў.

У якасці Р. супраць насякомых (камароў, сляпнёў, мошкі і інш.) выкарыстоўваюць кампазіцыі N,N-дыэтыл-*м*-талуаміду (ДЭТА) і дыметылфталату з інш. Р. (напр., 2-этылгександыол-1,3, эфірныя алеі), якія выпрабляюць у выглядзе ласьёнаў, крэмаў, аэразолей. Для адпужвання кляшчоў адзенне прамочваюць бензілбензаатам, N-бутылацэтанілідам. Для аховы насення ад птушак у *пратравы* дадаюць меркаптадыметур ці аксалат медзі, для абароны раслін ад зайцоў, аленяў і інш. у пасты для абмазкі ствалоў або ў прэпараты для апырсквання — тэтраметылтыурамдысульфід (ТМТД), каніфоль, дыцыклапентадыен і інш. *Я.Г.Міляшкевіч.*

РЭ́ПЕР (ад франц. repère метка, знак, зыходны пункт), 1) у геадэзіі — знак, які замацоўвае пункт зямной паверхні з вядомай абсалютнай вышынёй, вызначанай *нівеліраваннем* адносна зыходнай узроўневай паверхні. Адрозніваюць фундаментальныя Р. (жалезабетонныя пілоны), якія закладваюць у грунт праз 50—80 км на нівелірных лініях 1-га класа, на найб. адказных лініях 2-га класа і каля найважнейшых марскіх вадамерных установак), і радавыя Р. (грунтавыя — устанаўліваюцца ў зямлі і сценавыя — замацоўваюцца ў сценах або цокалях доўгатэрміновых збудаванняў), што закладваюць праз 5—7 км на нівелірных лініях усіх класаў. На Р. замацоўваецца метал. дыск — марка (дыям. да 5 см) з нумарам і абрэвіятурай ведамства. Гл. таксама *Геадэзічныя знакі*. 2) Р. у артылерыі — дапаможны пункт прыстрэлкі артыл. гармат з мэтай перанясення агню для паражэння цэлі. Адрозніваюць Р. сапраўдны (прыстрэленая цэль або мясц. прадмет з дакладна вывераными каардынатамі) і фіктыўны (цэнтр з 4—6 разрываў снарадаў, каардынаты якога вымераны дакладна).

РЭ́ПЕР у матэматыцы, сукупнасць лінейна незалежных *вектараў*, якія маюць агульны пачатак, узятых у пэўным парадку. Калі вектары, што складаюць Р., папарна артаганальныя, то Р. наз. артаганальным, а калі пры гэтым яны маюць адзінкавую даўжыню — артанармаваным (гл. *Артаганальная сістэма*). Напр., у трохмернай прасторы Р. можа служыць любая тройка папарна непаралельных адной плоскасці вектараў. Гл. таксама *Базіс* у матэматыцы.

РЭПЕРТУА́Р (франц. répertoire ад позналац. repertorium спіс, вопіс), сукупнасць драм. ці муз. твораў, якія выконваюцца ў пэўным т-ры, на эстрадзе, а таксама асобным акцёрам. Р. адрозніваюць таксама па стылях і жанрах (рамант., камед. і інш.); існуюць паняцці «сучасны Р.» (творы пра сучаснае жыццё), «класічны Р.» (класічныя нац. і сусв. драматургія, муз. творы) і інш.

РЭПЕРФАРА́ТАР (ад *рэ...* + *перфаратар*), тэлеграфнае прыстасаванне для аўтам. прабівання адтулін у папяровай стужцы ў адпаведнасці са знакамі *кода тэлеграфнага*, якія паступаюць ад тэлегр. перадатчыка. Выкарыстоўваецца разам з *трансмітэрам* для аўтам. перадачы транзітных тэлеграм.

РЭПЕТЫ́ЦЫЯ (ад лац. repetitio паўтарэнне), асноўная форма падрыхтоўкі (пад кіраўніцтвам рэжысёра) тэатр., эстрадных, цыркавых прадстаўленняў, канцэртнай праграмы, асобных нумароў, сцэн шляхам шматразовых паўтарэнняў (цалкам і часткамі). Адрозніваюць Р. застольныя (аналіз твора), у рэпетыцыйным памяшканні без дэкарацый, у выгарадках і на сцэне — манціровачныя, прагонныя і генеральныя.

РЭПЕТЭ́КСКІ ЗАПАВЕ́ДНІК, у Туркменіі, на ПдУ Каракумаў. Створаны ў 1928 для аховы прыроднага комплексу пустыні Каракумы. З 1978 біясферны запаведнік. Пл. 34,6 тыс. га. Замацаваныя бугрыстыя (з зараснікамі белага і чорнага саксаулаў) і барханна-градавыя пяскі. У фауне пераважаюць вялікая пясчанка, тушканчыкі, суслікі, джэйран, заяц-пясчанік; у арнітафауне 196 відаў птушак, у т.л. беркут, пугач пустынны, сыч дамавы, каршун чорны, сойка саксаульная, дзяцел белакрылы; 23 віды паўзуноў, у т.л. шэры варан, геконы, чарапахі, эфа пясчаная, стралазмяя; каля 1 тыс. відаў насякомых і павукападобных, у т.л. скарпіён, фаланга, тарантул, жукі-скарабеі, жужалі. Многія расліны і жывёлы — рэдкія і эндэмічныя віды.

РЭ́ПІК (Eupatorium), род кветкавых раслін сям. складанакветных. Каля 600 відаў. Пашыраны пераважна ў Амерыцы, некат. ў Еўразіі і трапічнай Афрыцы. На Беларусі 1 від — Р. канапляны (E. cannabinum). Трапляецца на вільготных берагах рэк, азёр, каля балот і інш. У Цэнтр. бат. садзе Нац. АН Беларусі інтрадукаваны Р. духмяны (E. aromaticum) і пурпуровы (E. purpureum).

Шматгадовыя травяністыя карэнішчавыя расліны. Сцёблы прамыя, простыя або галінастыя. Лісце супраціўнае, чаргаванае, радзей у кальчаках, суцэльнае або рассечанае. Лейкападобныя кветкі ў кошыках, сабраных у агульнае шчыткападобнае суквецце. Плод — сямянка. Р. канапляны — лек. (мачагонны, ванітоўны, танізоўны, ранагаючы сродак), тэхн. (сцёблы даюць грубае валакно), фарбавальная (з лісця і кораня атрымліваюць сінюю і чорную фарбы), алейная (насенне мае да 25% алею), дэкар., ядавітая расліна. *В.М.Прохараў.*

РЭ́ПІН Ілья Яфімавіч (5.8.1844, г. Чугуеў Харкаўскай вобл., Украіна — 29.9.1930), расійскі жывапісец і графік, педагог. Вучыўся ў Рысавальнай школе Т-ва заахвочвання мастакоў у І.Крамскога (1863), Пецярбургскай АМ (1864—71); у 1873—76 стыпендыят у Італіі і Францыі. У 1894—1907 выкладаў у Пецярбургскай АМ (у 1898—99 рэктар). Чл. т-ва перасоўных маст. выставак (з 1878; гл. *Перасоўнікі*). У творчасці Р. ўвасобіліся лепшыя дасягненні дэмакр. мастацтва яго часу. У шматлікіх палотнах адлюстраваў супярэчнасці грамадскага жыцця паслярэформеннай Расіі, выкрываў эксплуатацыю народа, сцвярджаў скрытую ў ім сілу і наспяванне пратэсту («Бурлакі на Волзе», 1870—73; «Хрэсны

І.Я.Рэпін.

ход у Курскай губерні», 1880—83), стварыў шэраг станоўчых вобразаў, ярка і праўдзіва адлюстраваў сілу і слабасць разначынскага рэв.-дэмакр. руху («Адмова ад споведзі», 1879—85; «Не чакалі», 1884; «Арышт прапагандыста», 1880—92). У гіст. карцінах імкнуўся паказаць трагічныя перапляценні чалавечых пачуццяў, моцныя драм. характары («Царэўна Соф'я», 1879; «Іван Грозны і сын яго Іван», 1885), раскрыць вальналюбны дух народа («Запарожцы пішуць пісьмо турэцкаму султану», 1878—91). Стварыў шматгранныя вобразы прадстаўнікоў розных слаёў рас. грамадства («Мужык з ліхім вокам», «Протадыякан», абедзве 1877).

Рэпік канапляны.

партрэты У.Стасава (1873), М.Мусаргскага (1881), П.Стрэпетавай (1882), Л.Талстога (1887), Э.Дузе (1891), В.А.Сярова (1901), І.Паўлава (1924), групавы партрэт «Урачыстае пасяджэнне Дзяржаўнага савета» (1901—03; з Б.Кустодзіевым і І.Куліковым), малюнкі «Неўскі праспект» (1887) і інш. У 1892—1904 перыядычна працаваў ва ўласным маёнтку Здраўнёва (Віцебская вобл.). Тут створаны карціны «Беларус», «Асенні букет», «Паляўнічы з ружжом» (усе 1892), «Касец-літвін» (1894), «Дуэль», «Месячная ноч. Здраўнёва», «Партрэт сына Юрыя на тэрасе здраўнёўскага дома» (усе 1896) і інш., шэраг эцюдаў, эскізаў («На Заходняй Дзвіне. Усход сонца», 1892; «Казанне Язафата Кунцэвіча», 1893, і інш.). Творам уласціва гарманічнае спалучэнне каларыту і святло-паветранага асяроддзя, строга прадуманая кампазіцыя, арганічная цэласнасць пластычнай формы і колеру, малюнка і жывапісу. Р. карыстаўся чыстымі светлымі фарбамі, якія ў яго палотнах аб'ядноўваліся ў адзіную колеравую гаму. У б. маёнтку Здраўнёва адкрыты *Рэпіна Ілы музей-сядзіба «Здраўнёва»*. З 1993 праводзіцца Міжнар. дзіцячы пленэр імя Р. Іл. гл. таксама да арт. *Рэалізм*, *Расія*.

І.Рэпін. Бурлакі на Волзе. 1870—73.

Тв.: Далекое близкое. 7 изд. М., 1964.

Літ.: Грабарь И. Репин. Т. 1—2. М., 1963—64; Новое о Репине. Л., 1969; Лясковская О.А. И.Е.Репин. [3 изд.]. М., 1982; Чуковский К.И. И.Репин. 2 изд. М., 1983; И.Репин: Живопись, графика: Альбом. Л., 1985; гл. таксама да арт. *Рэпіна Ілы музей-сядзіба «Здраўнёва»*.

РЭ́ПІНА ІЛЫ́ МУЗЕ́Й-СЯДЗІ́БА «ЗДРАЎНЁВА», музей, прысвечаны жыццю і творчасці на Беларусі рас. мастака І.Я.*Рэпіна*; філіял *Віцебскага краязнаўчага музея*. Адкрыты ў 1989 у в. Здраўнёва Віцебскага р-на, якая была набыта Рэпіным у 1892. На той час сядзіба ўключала сядзібны дом, флігель, 2 жылыя дамы, гасп. будынкі, невял. парк, сад са штучным вадаёмам (захаваліся лядоўня, ліпавая алея, асобныя дрэвы, вадаём). У 1893—95 сядзібны дом перабудаваны па ўласных эскізах мастака. На працягу 1892—1904 Рэпін жыў (з перапынкамі) у Здраўнёве і стварыў тут шмат твораў. Музей размешчаны ў асабняку, адноўленым па фотаздымках, эскізах мастака паводле праекта П.П.Кракалёва. Экспазіцыйная пл. будынка музея 212 м². Пл. ахоўнай зоны 12 га, зоны рэгулявання забудовы 35 га. Музей вядзе збіральніцкую, даследчую, культ.-асв. работу. 380 адзінак асн. і 850 навук.-дапаможнага фондаў (2000), якія захоўваюцца ў Віцебскім краязнаўчым музеі, у т.л. акварэлі Рэпіна «Конік», «Афрыканскі матыў», «Запарожац», малюнкі «Вершнік страляе», «Казанне Іасафата Кунцэвіча» (1893), «Партрэт Н.Рэпінай» і «Краявід. Здраўнёва» (абодва 1895), карціна «Дэзерцір» (1917), абразы Ісуса Хрыста (1894) і Маці Божай (1895), ліст мастака А.Сапунову, кніга «Успаміны і пісьмы І.Я.Рэпіна» з дарчым надпісам мастака У.Аскерку, рэчы побыту з дома ў Здраўнёве, лісты Т.Дзяканавай (унучкі мастака), фотаздымкі мастака, яго родных і знаёмых, успаміны, кнігі пра Рэпіна, падарункі музею. У экспазіцыі асабістыя рэчы Рэпіна, фотаздымкі, мэбля канца 19 — пач. 20 ст., рэчы, знойдзеныя ў час раскопак у Здраўнёве.

Літ.: Кичина Е.М. И.Е.Репин и Здравнево: В обретении и разлуке [2 изд.]. Ви-



Рэпіна Ілы музей-сядзіба «Здраўнёва».

Рэплеўскі касцёл Марыі.

РЭ́ПІХАВА, вадасховішча ў Ляхавіцкім р-не Брэсцкай вобл., каля в. Крывошын, ва ўрочышчы Рэпіхава. Створана на р. *Ліпнянка* ў 1984. Пл. 1,1 км², даўж. 2 км, найб. шыр. 800 м, найб. глыб. 3,5 м, аб'ём вады 2,1 млн. м³. Агараджальная дамба (даўж. 5,5 км) ахоўвае прылеглую тэрыторыю ад затаплення. Ваганні ўзроўню вады на працягу года 1,6 м. Выкарыстоўваецца для арашэння с.-г. угоддзяў, рыбагадоўлі.

РЭ́ПЛЕЎСКІ КАСЦЁЛ МАРЫ́І, помнік архітэктуры неаготыкі ў в. Рэпля Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. Закладзены ў 1902 з цэглы, неатынкаваны. Храм 2-вежавы базілікальнага тыпу з прамавугольнай апсідай і 2 сакрысцыямі. Цэнтр. ч. гал. фасада завершана ступеньчатым атыкам, падобны атык і над апсідай. Вежы 2-ярусныя (1-ы ярус — чацверыковы, 2-і — 8-гранны, завершаны шатром). У цэнтры фасада — гал. ўваход, вылучаны ступеньчатым франтонам, над уваходам — акно-ружа. Бакавыя фасады маюць стральчатыя аконныя праёмы, паміж імі размешчаны контрфорсы. *Т.І. Чарняўская.*

РЭ́ПЛІКА (франц. réplique, італьян. replica ад лац. replico паўтараю, адказваю), 1) у тэатры — элемент сцэнічнага дыялога: фраза ў адказ на словы партнёра, апошняя фраза (або яе частка) персанажа, за якой ідзе тэкст інш. дзейнай асобы. 2) У выяўленчым мастацтве — аўтарская копія маст. твора, якая адрозніваецца ад яго памерамі, часам дробнымі дэталямі. Можа быць выканана інш. мастаком пад наглядам аўтара.

РЭПЛІКА́ЦЫЯ (ад позналац. replicatio паўтарэнне), рэдуплікацыя, аўтарэплікацыя, працэс самаўзнаўлення макрамалекул *нуклеінавых кіслот*, які забяспечвае дакладнае капіраванне генет. інфармацыі і перадачу яе з пакалення ў пакаленне. Аснова — ферментатыўны сінтэз ДНК на матрыцы ДНК або РНК на матрыцы РНК; адзінка — рэплікон — участак генома, што знаходзіцца пад кантролем аднаго пункта пачатку (ініцыяцыі) рэплікацыі. У працэсе Р. ДНК акрамя ферментаў (ДНК-палімеразы, ДНК-лігазы, ДНК-метылазы і інш.) удзельнічаюць бялкі, якія расплятаюць двайную спіраль ДНК, стабілізуюць расплеценыя ўчасткі, прадухіляюць заблытванне малекул. У бактэрый сінтэз ДНК адбываецца са скорасцю 1 тыс., у *эўкарыётаў* — каля 100 нуклеатыдаў за секунду, але адначасова ў многіх пунктах адной малекулы; мае паўкансерватыўны характар: пры сінтэзе 2 даччыных малекул кожная ДНК утрымлівае адзін «стары» і адзін «новы» ланцужок. У арганізме Р. ДНК — вель-

мі дакладны працэс — частата памылак, якія прыводзяць да спантанных кропкавых мутацый, не перавышае 10^{-9} на 1 нуклеатыд у пакаленне. Р. РНК абмежавана вузкім колам вірусаў, што ўтрымліваюць РНК. Таксама Р. наз. падваенне храмасом, у аснове якога ляжыць Р. ДНК. *Р.Г.Заяц.*

РЭ́ПЛЯ, вёска ў Ваўкавыскім р-не Гродзенскай вобл., каля аўтадарогі Масты—Вял. Бераставіца. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 40 км на ПнЗ ад г. Ваўкавыск, 85 км ад Гродна, 15 км ад чыг. ст. Рось. 529 ж., 184 двары (2001). Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — касцёл найсвяцейшай Дзевы Марыі (пач. 20 ст.).

РЭПО́РТ (франц. report), біржавая здзелка на рынку каштоўных папер, пры якой ажыццяўляецца продаж каштоўных папер з адначасовым пагадненнем пра іх выкуп праз пэўны тэрмін па больш высокім кошце; здзелка на валютным рынку, пры якой ажыццяўляецца продаж нац. валюты за замежную пры адначасовым пагадненні пра яе выкуп праз пэўны тэрмін па больш высокім кошце. Накіраваны на павышэнне курсу каштоўных папер ці нац. валюты; часта носіць спекулятыўны характар.

РЭПРАГРА́ФІЯ [ад *рэпра*(*дукцыя*) + ... *графія*], абагульненая назва розных відаў капіравання тэкставых і ілюстрацыйных матэрыялаў, дакументаў і інш., не звязаных (у адрозненне ад *паліграфіі*) з выкарыстаннем друкарскіх форм. Да Р. адносяцца *дыязакапіраванне*, ксеракапіраванне (гл. *Ксераграфія*), *мікрафільмаванне, святлокапіраванне, тэрмакапіраванне, фотакапіраванне*, спосабы *электраграфіі*. Адрозніваецца дакладнасцю (факсімільнасцю) узнаўлення арыгінала, магчымасцю змены яго маштабу, кароткім тэхнал. цыклам (копія робіцца непасрэдна з арыгінала). У Р. выкарыстоўваецца разнастайная *размнажальная тэхніка*.

РЭПРАДУКТЫ́ЎНЫЯ О́РГАНЫ, органы жывёл і раслін, якія выконваюць функцыі размнажэння. У раслін — розныя структуры, якія забяспечваюць вегетатыўны, бясполы і палавы спосабы размнажэння. У *пракарыётаў* Р.о. — *споры*, гармагоніі і інш. У многіх грыбоў, водарасцей, моха-, папарапаце- і дзеразападобных, хвашчоў з выяўленым чаргаваннем пакаленняў прадстаўлены *спарангіямі* (бясполае) і *гаметангіямі* (палавое размнажэнне). У вышэйшых насенных раслін (гола- і пакрытанасенных) Р.о. — мікра- і мегаспарацыты, генератыўныя клеткі пылку і яйцаклетка. У шырокім сэнсе Р.о. таксама — кветкі і плады пакрытанасенных, стробілы голанасенных (мужч. і жан. шышкі) і інш. У жывёл Р.о. — *палавыя органы*.

РЭПРАДУКЦЫ́ЙНЫЯ ПРАЦЭ́СЫ, тэхналагічныя працэсы ўзнаўлення паліграф. сродкамі выяўл. выдавецкага арыгінала або твора выяўл. мастацтва. Уключаюць выраб *фотаформ* і *друкарскіх форм*, друкаванне тыражу, часам аддзелку адбіткаў (*рэпрадукцый*).

У пачатку *кнігадрукавання* выяўл. матэрыялы ўзнаўляліся з дапамогай *гравюры, літаграфіі*, пазней — рэпрадукцыйных фотаапаратаў (атрыманне негатываў), кантактна-капіравальных станкоў (для *дыяпазітываў*), *электраграві-равальных апаратаў* (гравіраванне друкарскіх форм высокага і глыбокага друку) і інш. (гл. *Формныя працэсы*). У залежнасці ад віду арыгінала выбіраецца спосаб узнаўлення: для тонавых чорна-белых арыгіналаў — *растрыраванне*, для каляровых — растрыраванне, *колерадзяленне* і колеракарэкціраванне, а таксама спосаб друкавання: высокі, афсетны і глыбокі (гл. *Шматкаляровы друк*), часам *фотатыпія*. Рэпрадукцыі друкуюць на ліставых друкарскіх машынах на асобных аркушах паперы павышанай гладкасці (каландраванай, мелаванай) фарбамі павышанай вязкасці. Для рэпрадукцый палепшанага тыпу ўжываюць лакіраванне і грэніраванне адбіткаў.

Літ.: Синяков Н.И. Технология изготовления фотомеханических печатных форм. 2 изд. М., 1974; Полянский Н.Н. Основы полиграфического производства. 2 изд. М., 1991. *У.М.Сацута.*

РЭПРАДУ́КЦЫЯ (ад *рэ*... + лац. productio стварэнне), узнаўленне і размнажэнне выяў (малюнкі, чарцяжы, карціны, фотаздымкі, тэксты, дакументы і інш.) фатаграфічным або паліграф. спосабам; узноўлены сродкамі друку малюнак, карціна, фотаздымак. Узнікла ў графіцы 16 ст. для капіравання твораў мастацтва (рэпрадукцыйная гравюра ў розных тэхніках), з 2-й пал. 19 ст. ручныя спосабы рэпрадуктавання выцеснены фотамеханічнымі. Р. характарызуюць колькасць фарбаў на адбітку (адна-, двух- і шматколерныя), спосаб друку (афсетны ці глыбокі друк, фотатыпія, шаўкаграфія і інш.), матэрыял, на якім робяць адбітак (папера, бляха, каленкор, цэлафан і інш.). Р. называецца факсімільнай, калі пры ўзнаўленні дакладна перадаюцца змест і ўсе асаблівасці аб'екта.

РЭПРЫ́ЗА (франц. reprise аднаўленне, паўтарэнне), 1) у музыцы — паўтарэнне адной або некалькіх тэм пасля іх развіцця або выкладання новага тэматычнага матэрыялу; адзін з кампазіцыйных сродкаў завяршэння вобразнатэматычнага развіцця. Прынцып рэпрызнасці ляжыць у аснове большасці тыповых кампазіцыйных схем: 2-часткавай рэпрызнай, 3-часткавай, ронда, санатнай, канцэнтрычнай і інш. У *санатнай форме* Р. — дакладнае або відазмененае паўтарэнне экспазіцыйнага матэрыялу. Р. можа значна адрозніваца ад *экспазіцыі*, што абумоўлена вобразным развіццём, зместавай канцэпцыяй твора. Існуюць таксама несапраўдная Р., дзе пач. тэма ўзнаўляецца ў неасноўнай танальнасці, і люстраная Р., у якой выкладзены матэрыял узнаўляецца ў адваротным парадку. 2) На эстрадзе — славесны ці пантамімічны камічны нумар (часам жарт, анекдот), які выконваецца акцёрамі размоўнага жанру, клоунамі (сола, дуэтам, групай). 3) У цырку — хада каня адным і тым жа *алюрам*; чаргаванне завершаных і звязаных паміж сабой трукаў, пасля якіх ідзе паўза.

Літ.: Гл. да арт. *Форма музычная.* *Ю.Дз.Златкоўскі* (музыка).

РЭПРЭЗЕНТАТЫ́ЎНАСЦЬ (франц. représentatif прадстаўнічы, паказальны ад лац. repraesentare прадстаўляць), уласцівасць часткі адлюстроўваць характарыстыкі цэлага. Паняцце шырока выкарыстоўваецца ў статыстыцы, сацыялогіі і інш. дысцыплінах у межах т.зв. выбарачнага метаду, накіраванага на даследаванне цэлага (ген. сукупнасці) шляхам вывучэння яго часткі (выбарачнай сукупнасці); атрыманыя пры аналізе выбарачнай сукупнасці вынікі пашыраюцца на ўсю ген. сукупнасць. Адрозненні паміж характарыстыкамі выбарачнай і ген. сукупнасцей наз. памылкай Р. Велічыня такой памылкі паддаецца стат. разліку і залежыць ад характарыстыкі ген. сукупнасці, ступені вагання (адхілення) даследуемых параметраў, зададзенай ступені верагоднасці, выбранай методыкі разліку параметраў. Акрамя аб'ектыўных фактараў памылкі Р. бываюць суб'ектыўныя, напр., пры атрыманні выбарачных даных шляхам *апытання*. Актуальнасць праблемы Р. абумоўлена ростам даследаванняў, арыентаваных на вырашэнне практычных пытанняў сац. кіравання ў галінах прам-сці, нар. адукацыі, аховы здароўя і інш., вывучэнне дэмаграфічных і этнакульт. працэсаў, ростам патрэбнасці ў правядзенні сац.-паліт. *маніторынгаў*, развіццём парламентарызму, актывізацыяй дзейнасці паліт. партый і грамадскіх аб'яднанняў. Фармальная тэорыя Р. распрацоўваецца ў межах аднаго з раздзелаў *матэматычнай статыстыкі* — тэорыі выбарачнага метаду. *С.А.Яцкевіч.*

РЭПРЭСА́ЛІІ (позналац. repressaliae ад reprehendere стрымліваць, спыняць), правамерныя прымусовыя дзеянні дзяржавы, накіраваныя на аднаўленне сваіх правоў, парушаных інш. дзяржавай, без пагрозы і ўжывання сілы. Міжнар. права забараняе Р., якія спалучаны з выкарыстаннем сілы (узброеныя Р.). Важная ўмова правамернасці Р. — абавязак дзяржаў, што маюць намер звярнуцца да Р., выкарыстаць мірную працэдуру спагнання шкоды, нанесенай правапарушэннем. Адмова дзяржавы-правапарушальніцы ад такой працэдуры або ад выканання рашэння, прынятага з прычыны выкарыстання гэтай працэдуры, адкрывае правамерную магчымасць для звароту да Р. Меры, што выкарыстоўваюцца ў якасці Р., павінны быць прапарцыянальныя правапарушэнню, якое іх выклікала, і спыняюцца з моманту аднаўлення становішча, якое яму папярэднічала.

РЭПРЭ́СІІ (ад позналац. repressio стрымліванне, задушэнне), карныя меры, пакаранні, якія прымяняюць дзярж. органы з мэтай прыпынення, задушэння чаго.-н. (гл. таксама *Рэпрэсіі палітычныя*).

РЭПРЭ́СІІ ПАЛІТЫ́ЧНЫЯ ў СССР, розныя меры прымусу, якія ўжывалі

ўлады СССР у адносінах да сваіх, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства па паліт. матывах. Ажыццяўляліся судамі або пазасудовымі органамі (т.зв. «тройкі», «двойкі», калегіі, асобыя нарады і інш.) ці ў адм. парадку органамі выканаўчай улады і службовымі асобамі і грамадскімі арг-цыямі з адм. паўнамоцтвамі. Р.п. ў СССР былі лагічным працягам рэпрэсій і тэрору перыяду *грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі 1918—22*, калі ў суд. і пазасуд. карнай практыцы прынцып права часта падмяняўся класавым падыходам і рэв. мэтазгоднасцю. На мяжы 1920—30-х г. камандна-адм. метады кіравання распаўсюдзіліся на большасць сфер грамадскага жыцця, дэмакр. сістэма прыняцця рашэнняў была выкраслена з жыцця грамадства. Рэзка абмежавалася самастойнасць ніжэйстаячых звёнаў выканаўчай улады і парт. органаў. Паступова выпрацоўвалася адзінства думак, якое падавалася нар. масам як вял. дасягненне ў сацыялістычным будаўніцтве. З пераходам да фарсіраванай *індустрыялізацыі* і суцэльнай *калектывізацыі* завяршыўся пераход ад паліт. рэжыму, у якім ген. лінія Кампартыі выпрацоўвалася ў ходзе супастаўлення і барацьбы думак, да рэжыму, дзе паліт. кіраўніцтва ажыццяўлялася на аснове жорсткай дысцыпліны. У СССР усталяваўся і пачаў умацоўвацца адм.-аўтарытарны рэжым, які пазней атрымаў назву *адміністрацыйна-камандная сістэма*. Ва ўсіх сферах грамадскага жыцця была зроблена стаўка на дыктат. «Рэпрэсіі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва, — лічыў І.В.*Сталін*, — з'яўляюцца неабходным элементам наступлення». Разгортванню масавых рэпрэсій спрыяў *культ асобы* Сталіна, ва ўмовах якога кожная праява непавагі да яго дзейнасці каралася як контррэв. злачынства. Сярод інш. прычын на Р.п. паўплывалі знешнія ўмовы існавання СССР у капіталіст. акружэнні. З далучэннем да СССР у 1939—40 *Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны, Бесарабіі*, Латвіі, Літвы і Эстоніі асаблівы размах набылі *дэпартацыі* насельніцтва на У СССР. У час Вял. Айч. вайны 1941—45 па абвінавачанні ў масавым супрацоўніцтве ці дапамозе ням. захопнікам дэпартаваны на У цэлыя народы: крымскія татары, калмыкі, немцы Паволжа, чэчэнцы, інгушы і інш. У пасляваен. перыяд былі рэпрэсіраваны многія ўдзельнікі антысав. руху ў Прыбалтыцы, Зах. Украіне і Зах. Беларусі. Буйнамаштабнай праявай Р.п. канца 1940 — пач. 50-х г. была т.зв. *Ленінградская справа*. Паводле дакладной запіскі Ген. пракуратуры, мін-ваў юстыцыі і ўнутр. спраў СССР ад 1.2.1954, у 1921—53 па абвінавачанні ў контррэв. злачынствах было асуджана 3 777 380 чал., з якіх 642 980 чал. прыгавораны да расстрэлу. Большасць з іх была асуджана ў 1934—38. Масавыя Р.п. 1930 — пач. 50-х г. афіцыйна асуджаны на XX (1956) і XXII (1961) з'ездах КПСС. У 1954—61 рэабілітавана больш як 700 тыс. чал. Аднак з сярэдзіны 1960-х г. работа па рэабілітацыі была згорнута. З пач. *перабудовы* ў 1987 утворана Камісія Палітбюро ЦК КПСС па дадатковым вывучэнні матэрыялаў, звязаных з рэпрэсіямі, што мелі месца ў 1930—40-х і пач. 1950-х г. У наступныя гады выдадзены Пастанова Палітбюро ЦК КПСС «Аб дадатковых захадах па аднаўленні справядлівасці ў адносінах да ахвяр рэпрэсій, што мелі месца ў перыяд 30—40-х і пачатку 50-х гадоў» (5.1.1989), Указ Прэзідэнта СССР «Аб аднаўленні правоў усіх ахвяр палітычных рэпрэсій 20—50-х гадоў» (13.8.1990), Законы РСФСР «Аб рэабілітацыі рэпрэсіраваных народаў» (26.4.1991) і «Аб рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій» (18.10.1991). У снеж. 1992 утворана Камісія пры Прэзідэнце Рас. Федэрацыі па рэабілітацыі ахвяр паліт. рэпрэсій. Усяго ў канцы 1980 — пач. 90-х г. рэабілітавана каля 1 млн. чал.

Р.п. на Беларусі адбываліся ў тых жа ўмовах і на тых жа падставах, што і ў інш. рэспубліках СССР. У 1920 — 30-я г. на іх адбілася становішча БССР як нац. саюзнай рэспублікі, якая непасрэдна межавала з капіталіст. Захадам. У 1920-х г. тут, як і паўсюдна ў СССР, сфарміраваўся своеасаблівы рэпрэсіўны механізм, які ўключыў заканад. базу, а таксама сістэму суд., пазасуд. органаў і *папраўча-працоўных лагераў* (гл. *ГУЛАГ*). Непасрэднымі выканаўцамі палітыкі Р.п. на Беларусі былі рэсп. ўстановы і мін-вы сістэмы ВЧК, АДПУ, НКУС, НКДБ, МДБ, МУС і КДБ. Усяго ў перыяд масавых Р.п. (1917—53) пацярпелі каля 600 тыс. жыхароў Беларусі. З іх 250 449 чал. асуджаны судамі ці пакараны рашэннямі пазасуд. органаў («двоек», «троек», асобых нарад, калегій АДПУ, НКУС, МДБ і інш.). У гэтую лічбу ўваходзяць і асуджаныя за калабарацыянізм (гл. *Калабарацыяністы*) у гады Вял. Айч. вайны 1941—45. Астатнія былі рэпрэсіраваны (пераважна дэпартаваны, высланы, сасланы) у адм. парадку. Найб. размах Р.п. прыпаў на 1937—38. У 1935—40 куды ўваходзіць і гэты перыяд, ад Р.п. пацярпелі 86 168 жыхароў Беларусі, з іх 28 425 расстраляны. Усяго ў ліст. 1917 — крас. 1953 за контррэвалюцыйныя злачынствы да смяротнай кары прыгавораны 35 868 чал. У сувязі з калектывізацыяй і *раскулачваннем* у 1920—30-я г. рэпрэсіравана і выслана за межы рэспублікі больш за 250 тыс. сялян і членаў іх сямей. Рэпрэсіі па абвінавачанні ў *нацыянал-дэмакратызме* (з канца 1920-х г.) выліліся ў расправу над прадстаўнікамі навукі, л-ры, мастацтва, работнікамі шэрагу наркаматаў рэспублікі. З 826 чал., якія праходзілі па спісе ўдзельнікаў бел. нац. руху 1917—24, былі рэпрэсіраваны ўсе, хто застаўся пражываць у СССР. У 1930-я г. больш за палавіну свайго асабістага складу страціў у выніку рэпрэсій Саюз пісьменнікаў Беларусі, практычна поўнасцю была разгромлена Бел. АН, у т.л. рэпрэсіраваны 26 акадэмікаў і 6 чл.-карэспандэнтаў. Кульмінацыяй расправы над нац. інтэлігенцыяй у 1930—31 стала справа «нацдэмаўскай контррэвалюцыйнай арганізацыі» «Саюз вызвалення Беларусі», па якой арыштавана 108 чал. Р.п. закранулі ўсе без выключэння пласты насельніцтва Беларусі. Іх ахвярамі сталі таксама сав., парт., камсамольскія, ваен. кадры, супрацоўнікі праваахоўных органаў. У 1931—38 органамі АДПУ—НКУС БССР былі праведзены паліт. працэсы над удзельнікамі *«Аб'яднанага антысавецкага падполля»*, «Беларускай аўтакефальнай царквы», *«Беларускай народнай грамады», «Беларускага нацыянальнага цэнтра», «Беларускага філіяла меншавікоў», «Беларускага філіяла Прампартыі», «Беларускага філіяла Працоўнай сялянскай партыі», Польскай арганізацыі вайсковай*, «Саюзнага бюро РСДРП (меншавікоў)», «Партыі вызвалення сялян» і інш. Былі «выкрыты» таксама «контррэвалюцыйныя, шкодніцкія» арг-цыі амаль ва ўсіх сферах нар. гаспадаркі, у т.л. ў наркаматах земляробства, аховы здароўя, асветы, трактарацэнтры, у галіне нарыхтоўкі сельгаспрадуктаў, папяровай прам-сці. Грамадзяне Беларусі ў значнай сваёй частцы неабгрунтавана прыцягваліся да адказнасці як удзельнікі антысав., контррэв. арг-цый і інш., З вер. 1939 рэпрэсіўная палітыка ўлад з У перамясцілася ў Зах. Беларусь, адкуль у 1939—41 дэпартавана больш за 100 тыс. чал. У выніку 2 пасляваен. аперацый па перасяленні (жн. 1951, крас. 1952) з Зах. Беларусі ў Сібір дэпартаваны 2079 сем'яў (каля 9000 чал.) Першая значная рэабілітацыя ахвяр Р.п. праведзена ў 1939—41 у адносінах да рэпрэсіраваных парт., дзярж. і ваен. дзеячаў. Усяго за 1930—40-я г. (і да пач. 1954) рэабілітавана больш за 35 тыс. жыхароў Беларусі. Распачатая з сярэдзіны 1950-х г. у сувязі з хрушчоўскай «адлігай» масавая рэабілітацыя ахвяр Р.п. у 2-й пал. 1960-х г. была згорнута. Новы імпульс гэты працэс набыў у час перабудовы. З 1990 у БССР, потым у суверэннай Рэспубліцы Беларусь пачала фарміравацца ўласная заканад. база па пытаннях рэабілітацыі і забеспячэння ахвяр Р.п. 21.12.1990 Вярх. Савет Беларусі зацвердзіў «Палажэнне аб парадку аднаўлення правоў грамадзян, якія пацярпелі ад рэпрэсій у 20—50-х гадах». Яно прадугледжвала парадак аднаўлення працоўных, пенсіённых, жыллёвых і інш. правоў грамадзян, якія пацярпелі ад рэпрэсій, а таксама кампенсацыю прычыненых ім маёмасных і інш. страт. У адпаведнасці з гэтым дакументам Савет Міністраў рэспублікі 29.12.1990 прыняў пастанову «Аб прадастаўленні льгот асобам, неабгрунтавана прыцягнутым да крымінальнай адказнасці ў перыяд рэпрэсій 20—50-х гадоў і ў далейшым рэабілітаваным». Пастанова Вярх. Савета БССР ад 6.6.1991 «Аб парадку рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій 20—50-х гадоў у Беларускай ССР» значна спрасціла працэдуру рэабілітацыі рэпрэсіраваных. У наступныя гады заканад. органамі і ўрадамі Рэспублікі Беларусь прыняты яшчэ некалькі дапаўненняў да пастаноў і падзаконных актаў па рэабілітацыі. Імі прадугледжаны разам з рэабілітацыяй грамадзян аднаўленне страчаных імі ў

сувязі з рэпрэсіямі сац.-палiт. і маёмасных правоў. Усяго з 1954 да цяперашняга часу на Беларусі рэабілітавана больш як 200 тыс. рэпрэсіраваных. Рэабілітацыя працягваецца.

Літ.: Реабилитация: Полит. процессы 30—50-х гг. М., 1991; Адамушка У. Палітычныя рэпрэсіі 20—50-х гг. на Беларусі. 1994; Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX ст.: Матэрыялы навук.-практыч. канф. Мн., 1998; Земсков В. Политические репрессии в СССР (1917—1990 гг.) // Россия, XXI. 1994. № 1/2. *У.І.Адамушка.*

РЭПТЫЛІІ, гл. *Паўзуны.*

РЭПУТА́ЦЫЯ (франц. réputation ад лац. reputatio абдумванне, роздум), агульная думка пра годнасць ці недахоп чаго-н. у каго-н., грамадская ацэнка.

РЭ́РЫХ Алена Іванаўна (12.2.1879, С.-Пецярбург — 5.10.1955), рускі філосаф. Жонка М.К.*Рэрыха*, маці С.М.*Рэрыха*. З 1919 жыла і працавала ў Англіі, з 1921 — у ЗША, з 1924 — у Індыі. Разам з М.К.Рэрыхам у 1923 заснавала Музей імя Рэрыха ў Нью-Йорку, у 1928 — Ін-т гімалайскіх даследаванняў «Урусваці» ў Індыі (названы ад духоўнага імя Р.), яго ганаровы прэзідэнт. Філас. погляды Р. фарміраваліся пад уплывам традыц. усх. і хрысц. вучэнняў і школ (С.Вівеканда, Рамакрышна, «Бхагавадгіта», «Дабраталюбства», «Лам-рым Чэн-по» Цзон Ка Па і інш.). У гал. філас. працы «Вучэнне Жывой Этыкі» («Агні Ёга», кн. 1—14, 1924—38) прапанавала вучэнне, якое накіравана на фарміраванне духоўнай культуры Новай Эпохі («Сацыя Югі») шляхам сінтэзу ўсх. і зах. філасофіі, рэлігіі, навукі і мастацтва. Распрацавала канцэпцыі касм. эвалюцыі чалавека і чалавецтва, псіхічнай энергіі, вучэнне пра бязмежнасць і іерархію Святла, пра сілу думкі і інш., якія аб'ядноўвае ідэя самаўдасканальвання чалавека праз засваенне духоўнай культуры. Пераклала на рус. мову «Сакрэтную Дактрыну» А.П.Блавацкай і «Пісьмы Махатм».

Тв.: Учение Живой Этики. [Кн. 1—14]. Рига; М., 1989—96; Преподобный Сергий Радонежский // Знамя Преподобного Сергия Радонежского. Новосибирск, 1991; Письма Елены Рерих, 1929—1938. Т. 1—2. Мн., 1992; Письма в Америку. Т. 1—4. М., 1996—99; Основы буддизма. 3 изд. Рига, 1997; Письма. Т. 1—3. М., 1999—2001; У порога Нового Мира. М., 2000.

Літ.: Егорова М.Н. Некоторые основные аспекты учения «Живой Этики», или Агни Йоги // Филос. науки. 1995. №5/6; 1996. № 1—4; Шапошникова Л.В. Сотрудница Космических Сил // Новая эпоха. 1999. № 1. *Р.З.Шайхатараў.*

РЭ́РЫХ (сапр. Рорых) Мікалай Канстанцінавіч (9.10.1874, С.-Пецярбург — 13.12.1947), расійскі жывапісец, мысліцель, пісьменнік, археолаг, вандроўнік, грамадскі дзеяч. Акад. Пецярбургскай АМ (з 1909). Правадз. чл. шматлікіх замежных акадэмій. Скончыў Пецярбургскую АМ (1897), юрыд. ф-т Пецярбургскага ун-та (1898), вучыўся ў А.Куінджы, у студыі Ф.Кармона ў Парыжы (1900—01). Зазнаў уплывы мадэрна, сімвалізму, візант. і стараж.-рус. мастацтва. Чл. аб'яднання «*Свет мастацтва*» (у 1910—19 старшыня). Сакратар імператарскага Т-ва заахвочвання мастакоў (з 1901) і дырэктар Рысавальнай школы пры ім (1906—18). Ініцыятар і арганізатар першага ў гісторыі міжнар. дагавору ў абарону культ. помнікаў (Сцяг Міру і Пакт Рэрыха, 1935). З 1918 жыў і працаваў у Фінляндыі, з 1919 у Лондане, з 1920 у Нью-Йорку, з 1924 у Індыі. З А.*Рэрых* сцвярджаў Вучэнне Жывой Этыкі. У творчасці імкнуўся да раскрыцця новага разумення культуры, якую ён разглядаў як служэнне Адзінаму Святлу. У 1924—28 і 1934—35 ажыццявіў Цэнтральнаазіяцкую экспедыцыю і экспедыцыю ў Кітай і Манголію. На аснове сабраных матэрыялаў заснаваў (з жонкай) Ін-т гімалайскіх даследаванняў («Урусваці»,

М.**Рэрых**. Мадонна Арыфлама. 1932.

1928—42). З канца 1890-х г. пад уплывам заняткаў археалогіяй і цікавасці да слав. і скандынаўскай гісторыі пісаў гіст. сюжэтна-дакладныя кампазіцыі: «Ганец» (1897), «Заморскія госці» (1901), «Горад будуюць» (1902), «Дазор» (1905), «Бой» (1906); цыкл «Архітэктурная серыя» (1903—04) і інш. З 1910-х г. у яго творчасці пераважалі пейзажныя матывы, творы вызначаліся напружанай эмацыянальнасцю вобразаў, лапідарнасцю выяўл. сродкаў, плоскаснай арнаментальнасцю і дэкар. стылізацыяй кампазіцыі, дакладнасцю і контурнасцю малюнка, павышанай увагай да перадачы светлавых эфектаў, кантрастнасцю лакальных колеравых плям. Пазней імкнуўся да пераасэнсавання гіст. падзей у іх сімвалічнай сугучнасці з сучаснасцю, выяўлення іх як ланцуга сусв. катаклізмаў, эпізодаў адзінай касм. эвалюцыі: серыі «Прарочая» (1912—14), «Санкта» (1922); творы «Тры радасці» (1916), «Чырвоныя коні» (1925) і інш. З 2-й пал. 1920-х г. стваraў пераважна серыі пейзажаў Гімалаяў, Тыбета, Манголіі, сімвалічныя кампазіцыі. Творы адметныя эпічнасцю, велічнасцю і рамант. прыўзнятасцю вобразаў, абвостранай яснасцю форм. Каларыт карцін вылучаецца чысцінёй, празрыстасцю і багаццем колеравых суадносін у спалучэнні з сілай і глыбінёй тонаў. Лічыў, што менавіта гарманічнае супастаўленне колеру і тону ў спалучэнні з прыгажосцю і велічу думкі найб. уздзейнічае на гледача: серыі «Гімалайская», «Настаўнікі Усходу», «Святыя горы», «Ашрамы», «Сікім», «Майтрэя»; кампазіцыі «Гуга Чохан» (1931), «Мадонна Арыфлама» (1932), «Знакі Гэсера» (1940), «Гімалаі. Нанда-Дэві» (1941), «Тыбет. Манастыр» (1942), «Памятай» (1945) і інш. Аформіў спектакль «Пер Гюнт» (1912) Г.Ібсена ў Маскоўскім маст. т-ры, балет «Вясна свяшчэнная» І.Стравінскага (1913), оперу «Князь Ігар» А.Барадзіна (1914) для «Рускіх сезонаў» С.Дзягілева. Працаваў таксама ў манум.-дэкар. мастацтве: эскізы царк. размалёвак (у т.л. царквы Св. Духа ў Талашкіне пад Смаленскам 1914) і мазаік, жывапісных пано і маёлікавых фрызаў у прыватных асабняках.

Тв.: Врата в будущее. Рига, 1991; Нерушимое. Рига, 1991; Твердыня Пламенная. Рига, 1991; Держава Света. Священный дозор. Рига, 1992; Цветы Мории. Пути Благословения. Сердце Азии. Рига, 1992; Знамя Мира. М., 1995; Листы дневника. Т. 1—3. М. 1995—96; Цветы Мории. Мн., 1997; Письма в Америку, 1923—1947. М., 1998; Алтай — Гималаи. М., 1999; Шамбала. Мн. и др., 2000.

Літ.: Беликов П., Князева В. Рерих. М., 1972; Н.К.Рерих: Жизнь и творчество: Сб. ст. М., 1978; Держава Рериха. М., 1994; Шапошникова Л.В. Великое путешествие: В 3 кн. Кн. 1. М., 1998; Н.К.Рерих: Биобиблиогр. указ. М., 1999.

РЭ́РЫХ Святаслаў Мікалаевіч (23.10.1904, С.-Пецярбург — 30.1.1993), расійскі і індыйскі мастак, мастацтвазнавец, грамадскі дзеяч. Сын М.К.*Рэрыха* і А.І.*Рэрых*. Ганаровы чл. АМ СССР (1978) і Балгарскай АМ (1978), чл. Інд. нац. акадэміі прыгожых мастацтваў (1987). Вучыўся на арх. курсах Калумбійскага і Гарвардскага ун-таў (ЗША, 1920—23). З 1923 узначальваў Міжнар. цэнтр мастацтваў «Карона Мундзі», з 1928 віцэ-прэзідэнт Музея М.Рэрыха ў Нью-Йорку, чл.-заснавальнік Пакта Рэрыха, таксама кіраваў даследаваннямі па батаніцы, аюрведычнай і тыбецкай медыцыне, вывучэннем гімалайскага і тыбецкага мастацтва і фальклору ў Міжнар. НДІ «Урусваці». З 1931 жыў у Індыі. У 1980-я г. ў г. Бангалор заснаваў культ.-асв. «Цэнтр мастацтваў», у які ўваходзяць школа выяўл. мастацтваў,

музей стараж.-інд. мастацтва, выставачныя залы і маст. галерэя імя М.Рэрыха. Па яго ініцыятыве створаны Міжнар. цэнтр Рэрыхаў з Цэнтрам-музеем імя М.Рэрыха (1989, Масква) і Міжнар. мемарыяльны трэст імя М.Рэрыха (1992, Індыя). Яго творчасць як мастака і як грамадскага дзеяча прасякнута глыбокім гуманізмам. У творчасці абапіраўся на лепшыя традыцыі рас. рэаліст. мастацтва, заходнееўрап. жывапісу, стараж. традыцыі Індыі. Сярод лепшых твораў: «Чаша Буды» (1938), трыпціх «Укрыжаванне чалавецтва» (1939—40), «Гірнар» (1944), серыя «Свяшчэнная флейта» (1946—48), «Дэвіка Рані Рэрых» (1951), «Чырвоная зямля» (1953), «Вечнае жыццё» (1954), «Вясна» (1958), «П'ета», «Вогненны дракон» (абодва 1960), «Папяражданне чалавецтву» (1962), «Дажджы» (1971), «Мая краіна цудоўная» (1974), «Палюбі бліжняга свайго» (1976). Маст. мова партрэтаў, пейзажаў, жанравых кар-

С.**Рэрых**. Палюбі бліжняга свайго. 1976.

цін і кампазіцыйных фантазій вылучаецца поліфанічным гучаннем колеру, светланоснасцю. Філас. светапогляд Р. складаўся на аснове гуманіст. традыцый эпохі Адраджэння і вывучэння Жывой Этыкі. Лічыў, што прыгажосць з'яўляецца эвалюцыйнай сілай, якая пераўтварае жыццё.

Тв.: Стремиться к Прекрасному. М., 1993; Свет Искусства. М., 1994; Священная флейта: [Альбом]. Самара, 2000.

Літ.: Тюляев С. Святослав Рерих. М., 1977. *Р.З.Шайхатараў.*

РЭ́СЕЛ, Расел (Russell) Генры Норыс (25.10.1877, г. Ойстэр-Бей, ЗША — 18.2.1957), амерыканскі астраном. Скончыў Прынстанскі ун-т (1900), дзе і працаваў з 1911, у 1912—47 дырэктар астр. абсерваторыі гэтага ун-та. Навук. працы па астрафізіцы, зорнай астраноміі і касмалогіі. Вызначыў залежнасць паміж свяцільнасцю і спектральнымі класамі зорак (гл. *Герцшпрунга—Рэсела дыяграма*). Аўтар адной з першых гіпотэз аб эвалюцыі зорак.

Тв.: Рус. пер. — Солнечная система и ее происхождение. М.; Л., 1944.

Літ.: Паннекук А. История астрономии: Пер. с англ. М., 1966.

РЭСІ́ВЕР (англ. receiver ад receive атрымліваць, прымаць, умяшчаць), прыстасаванне (металічная ёмістасць) для збірання пары, газу ці паветра і выраўноўвання іх ціску. Выкарыстоўваецца ў кампрэсарных і паравых установах, сістэмах пнеўмапрывода і інш.

У паравых машынах Р. выраўноўвае ціск пары пры пераходзе яе з цыліндра высокага ціску ў цыліндр нізкага ціску. У кампрэсарных установах Р. збірае паветра (газ) пры часовым спыненні яго спажывання, выраўноўвае ціск паветра, што нераўнамерна напампоўваецца кампрэсарам, а таксама ахалоджвае паветра і ачышчае яго ад кропляў масла і вільгаці.

РЭСІСТЭ́НСІЯ (Resistencia), горад на ПнУ Аргенціны, адм. ц. прав. Чака. Больш за 300 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: бавоўна-ачышчальная, алейная, дрэваапрацоўчая. Вытв-сць экстракту кебрача.

РЭСІ́ФІ (Recife), Пернамбуку, горад у Бразіліі, на крайнім усходзе мацерыка Паўд. Амерыка. Адм. ц. штата Пернамбуку. Засн. ў 1548 на месцы рыбацкага пасёлка. Разам з прыгарадамі каля 3 млн. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Найважн. порт краіны. Міжнар. аэрапорт. Гал. эканам. цэнтр ПнУ Бразіліі. Прам-сць: харчасмакавая (цукровая, тытунёвая, спіртагарэлачная), тэкст., маш.-буд., цэм., хім., гарбарна-абутковая. 3 ун-ты. Філалагічная акадэмія, Музей штата. Арх. помнікі калан. перыяду і класіцызму 19 ст. Цэнтр турызму.

Горад **Рэсіфі**. Прыморская частка.

РЭСКРЫ́ПТЫ АЛЯКСА́НДРА II 1857 па сялянскім пытанні ў Расійскай імперыі, прадпісанні імператара *Аляксандра II* ген.-губернатарам аб утварэнні дваранскіх губ. к-таў па падрыхтоўцы праектаў *сялянскай рэформы 1861*. Вызначалі арганізац. структуру і гал. прынцыпы дзейнасці гэтых к-таў, якія распрацоўвалі асн. па-

РЭ́СКІН, Раскін (Ruskin) Джон (8.2.1819, Лондан — 20.1.1900), англійскі тэарэтык мастацтва, гісторык, публіцыст. Скончыў Оксфардскі ун-т (1839). Выкладаў у 1-м Рабочым каледжы. Быў паслядоўнікам Т.*Карлайля*. У творах «Сучасныя жывапісцы» (т. 1—5, 1843—60), «Сем светачаў архітэктуры» (1849), «Камяні Венецыі» (т. 1—3, 1851—53), «Палітычная эканомія мастацтва» (1857) развіваў канцэпцыю адзінства прыгажосці і дабрыні А.*Шэфтсберы*, выступаў з рамант. крытыкай капіталіст. цывілізацыі, варожай мастацтву як сінтэзу прыроды, прыгажосці і высокай маральнасці, заклікаў да адраджэння сярэдневяковай ручной працы, калект. форм маст. творчасці. Паўплываў на фарміраванне эстэт. поглядаў *прэрафаэлітаў* (кн. «Прэрафаэлітызм», 1851). Быў блізкі да У.*Морыса*, удзельнічаў у стварэнні яго маст.-прамысл. майстэрняў. Рабіў малюнкі і акварэлі.

РЭСКРЫ́ПТ (ад лац. rescriptum літар. пісьмовы адказ), 1) у Стараж. Рыме пісьмовы адказ імператара (меў сілу закону) на пададзенае яму для вырашэння пытанне. 2) Пісьмо манарха высокапастаўленай асобе (напр., міністру, губернатару) з якім-н. даручэннем, а таксама з выказваннем удзячнасці за аказаныя паслугі, з абвяшчэннем пра ўзнагароду і інш.

лажэнні адмены *прыгоннага права*. 2.12.1857 Аляксандр II падпісаў рэскрыпт на імя віленскага ген.-губернатара У.І.*Назімава*, згодна з якім у Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губ. дазвалялася стварыць дваранскія к-ты з выбарных ад памешчыкаў кожнага павета і 2 памешчыкаў, прызначаных мясц. губернатарам, а потым агульную камісію ген.-губернатарства ў Вільні. 17.12.1857 такі ж рэскрыпт накіраваны пецярбургскаму ген.-губернатару графу П.М.Ігнацьеву. Гэтыя рэскрыпты — першыя афіц. апублікаваныя акты царскага ўрада пра ўмовы вызвалення сялян. На працягу 1858, паводле аналагічных рэскрыптаў, створаны дваранскія к-ты амаль ва ўсіх губернях Еўрап. Расіі. У адпаведнасці з іх праектамі за памешчыкамі захоўвалася права ўласнасці на ўсю зямлю панскіх маёнткаў, за сялянамі — права карыстання зямельнымі надзеламі, за якія яны па-ранейшаму былі абавязаны адбываць паншчыну або плаціць *аброк*. Памешчыкі таксама захоўвалі права паліцэйскага нагляду за прыгоннымі ў маёнтках. Пасля ўнясення выкупу за сядзібу (не пазней як праз 12 гадоў) сяляне станавіліся асабіста вольнымі. Абвяшчэнне рэскрыптаў прывяло да масавага абеззямельвання сялян памешчыкамі, узмацнення паляризацыі насельніцтва вёскі напярэдадні ліквідацыі прыгоннiцтва.

Літ.: Захарова Л.Г. Самодержавие и отмена крепостного права в России, 1856—1861. М., 1984. *В.П.Панюціч.*

РЭ́СЛІНГ (ад англ. wrestling барацьба), спартыўныя адзінаборствы, у якіх адзін з сапернікаў імкнецца вымусіць другога дакрануцца плячыма да дывана на падлозе («пакласці на лапаткі»). Налічваецца больш за 50 разнавіднасцей Р. (*вольная барацьба, грэка-рымская барацьба, сумо* і інш.). Барцы карыстаюцца прыёмамі ў межах правілаў для кожнага віду барацьбы. Адзін з асн. прыёмаў—захват, які дазваляе ўтрымліваць саперніка і кантраляваць яго рухі.

Вядомы са стараж. часоў. Паядынкі паміж барцамі ўваходзілі ў праграму Алімп. гульняў у Стараж. Грэцыі з 708 да н.э. З 1921 аматарскі Р. аб'ядноўвае Міжнар. аматарская федэрацыя барацьбы (FILA). У праграму сучасных Алімп. гульняў уваходзяць грэка-рымская і вольная барацьба. Па асобных відах Р. штогод праводзяцца чэмпіянаты свету. Спаборніцтвы сярод жанчын праводзяцца з 1988. Паядынкі паміж прафесіяналамі адбываюцца звычайна на рынгу накшталт баксёрскага.

А.М.Петрыкаў.

РЭСПЕКТА́БЕЛЬНАСЦЬ (франц. respectable ад лац. respectus погляд), ацэнка каго-н. ці чаго-н., годнага павагі. Асноўныя крытэрыі Р. — паважанасць, шаноўнасць, сталасць, важнасць. Напр., рэспектабельна выглядаць, рэспектабельная сям'я.

РЭСПІ́ГІ (Respighi) Атарына [9.6(7).1879, г. Балонія, Італія — 18.4.1936], італьянскі кампазітар, педагог. Чл. Нац. акадэміі дэі Лінчэі (1932). Вучыўся ў муз. ліцэі ў Балонні (1891—99). Сярод педагогаў: Дж. Мартучы, М.Рымскі-Корсакаў, М.Брух. З 1913 праф. кансерваторыі «Санта-Чэчылія» ў Рыме (у 1924—26 дырэктар). У яго творчасці спалучаліся тэндэнцыі *імпрэсіянізму* і *неакласіцызму*, сучасная тэхніка пісьма і імкненне да архаічнай мелодыкі стараж. форм, маляўнічасць аркестроўкі. Сярод твораў: оперы, балеты; творы для арк., у т.л. сімф. трылогія «Фантаны Рыма» (1916), «Пініі Рыма» (1924), «Рымскія ўрачыстасці» (1928); для інстр. з арк., у т.л. «Грыгарыянскі канцэрт» для скрыпкі з арк. (1921); п'есы для фп. і інш. інстр.; песні, рамансы, рэд. і арк. версіі італ. музыкі 17—19 ст.

РЭСПІРА́ТАР (ад лац. respiro выдыхаю, дыхаю), індывідуальная прылада працяглага ці аднаразовага карыстання для аховы органаў дыхання чалавека ад пылу і шкодных рэчываў. Складаецца з маскі (паўмаскі) і фільтра (вата, фетр, спец. тканіна і інш.). Існуюць ізалявальныя (шлангавыя, кіслародныя), што выкарыстоўваюцца пры недастатковай колькасці ў паветры кіслароду (менш за 16%) ці пры наяўнасці ў паветры шкодных рэчываў (напр., пры аварыйна-выратавальных работах), а таксама фільтравальныя (супрацьпылавыя), якія выкарыстоўваюць і для аховы ад радыеактыўнага пылу.

РЭСПУ́БЛІКА (лац. respublica ад res справа + publicus агульны, усенародны), форма дзярж. праўлення, пры якой вярх. ўлада належыць выбраным на пэўны тэрмін органам; краіна з такім дзярж. ладам. Першыя Р. ўзніклі як антыпод манархіі яшчэ ў ант. эпоху. Існавалі ў рабаўладальніцкім (Карфаген, Афіны, Стараж. Рым) і феад. (Венецыя, Ноўгарад, Пскоў) грамадствах. У наш час Р. з'яўляецца асн. формай праўлення ў большасці краін. Форма праўлення, заснаваная на нар. прадстаўніцтве, лічыцца Р. незалежна ад таго, з'яўляецца права грамадзян на ўладу рэальным ці яно толькі дэкларуецца. Ступень забяспечанасці асабістых і паліт. правоў грамадзян ва ўмовах Р. залежыць ад сац.-эканам. ладу і суадносін паліт. сіл у грамадстве.

У залежнасці ад таго, перад кім нясе адказнасць урад — перад парламентам або прэзідэнтам — адрозніваюць Р. парламенцкія і прэзідэнцкія. У парламенцкіх Р. (напр., Індыя, Італія, Латвія, Малдова, ФРГ) прэзідэнт краіны выбіраецца парламентам, а ўрад утвараецца паліт. партыяй ці парт. кааліцыяй, якая мае большасць месцаў у парламенце. У прэзідэнцкіх Р. (Беларусь, ЗША, Мексіка, Рас. Федэрацыя і інш.) прэзідэнт выбіраецца непасрэдна насельніцтвам, або калегіяй выбаршчыкаў, адначасова ўзначальвае органы дзярж. улады і ўрад, які ён фарміруе.

Усталяванне рэсп. формы праўлення на Беларусі звязана з утварэннем 1.1.1919 БССР. 19.9.1991 на сесіі Вярх. Савета БССР была зацверджана новая назва краіны — Рэспубліка Беларусь.

Літ.: Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, 1994 г. (са змян. і дап.). Мн., 1997; Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мн., 2000. *С.А.Яцкевіч.*

«РЭСПУ́БЛІКА», грамадска-палітычная газета. Выдаецца з чэрв. 1991 у Мінску на бел. і рус. мовах штодзённа. Заснавальнік — Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Асвятляе пытанні грамадска-паліт. жыцця краіны, праблемы эканомікі, культуры, навукі, адукацыі, спорту, дзейнасць органаў заканадаўчай і выканаўчай улады. Матэрыялы змяшчаюцца пад рубрыкамі: «Што людзі пішуць», «Дыялог», «Званы госць», «Падрабязнасці», «Яшчэ не вечар», «Алімпія», «Прамая лінія» і інш. Публікуе пастановы СМ рэспублікі, распараджэнні прэм'ер-міністра, інш. прававыя акты рэсп. органаў. Мае рэгулярныя дадаткі «Рэспубліка дзелавая» і «Усё аб падатках», асобным тыражом выходзяць «Вести потребкооперации».

У.Ф.Нікалайчук.

РЭСПУ́БЛІКА БЕЛАРУ́СЬ, гл. *Беларусь.*

РЭСПУБЛІКА́НСКАЯ ПА́РТЫЯ (РП), палітычная партыя цэнтрысцкага кірунку на Беларусі. Створана ў сак. 1994. Вышэйшы орган паміж з'ездамі — Цэнтр. праўленне і яго выканком. Асн. мэта — адраджэнне і стварэнне моцнай, суверэннай, гуманнай, дэмакр. бел. дзяржавы з дастатковай ступенню інтэграцыі з рэспублікамі б. СССР і краінамі Захаду, якая дазволіць забяспечыць выхад з эканам. і сац.-паліт. крызісу. Выступае за шматукладную эканоміку, арыентацыю яе на вырашэнне сац. задач, дасягненне высокага ўзроўню жыцця, стварэнне механізмаў, якія дазваляюць спалучаць эканам. эфектыўнасць і сац. справядлівасць; за фарміраванне сучаснай цывілізаванай сістэмы рынкавых адносін і механізмаў пры актыўнай ролі дзярж. рэгулявання эканомікі; за стварэнне высокаэфектыўнай эканомікі, гнуткай і ўспрымальнай да навук.-тэхн. прагрэсу, пастаянна зменлівых грамадскіх і асабістых патрэб. Асн. сац. база партыі — прадпрымальнікі, банкіры, кіраўнікі дзярж. прадпрыемстваў, рабочыя, студэнты, сяляне. На 1.1.2001 партыя аб'ядноўвала 8,5 тыс. чал.

РЭСПУБЛІКА́НСКАЯ ПА́РТЫЯ (англ. Republican Party), адна з дзвюх вядучых паліт. арг-цый у ЗША; апанент *Дэмакратычнай партыі*. Засн. ў 1854 на базе партыі *вігаў*. Першым ад Р.п. на пасаду прэзідэнта краіны ў 1860 выбраны А.*Лінкальн*. У час *грамадзянскай вайны ў ЗША 1861—65* партыя падтрымлівала паўн. штаты (федэральны цэнтр). Да канца 19 ст. акрэслілася як кансерватыўная групоўка з ліберальным крылом, прадстаўляла пераважна інтарэсы прамыслоўцаў і банкіраў. З пач. 20 ст. выступае і за сац. рэформы пры нязменным захаванні прыватнай ініцыятывы (гл. таксама *Кансерватызм, Лібералізм*). Прэзідэнты ЗША ад Р.п. (10 супраць 7 прэзідэнтаў-дэмакратаў у 20 ст.): А.Лінкальн (1861—65), Э.Джонсан (1865—68),

У.С.*Грант* (1869—77), Р.Б.Хейс (1877—81), Дж.А.Гарфілд (1881), Ч.А.Артур (1881—85), У.Мак-Кінлі (1897—1901), Т.*Рузвельт* (1901—09), У.Х.Тафт (1909—13), У.Гардынг (1921—23), К.Кулідж (1923—29), Г.К.*Гувер* (1929—33), Д.Д.*Эйзенхаўэр* (1953—61), Р.М.*Ніксан* (1969—74), Дж.Р.*Форд* (1974—76), Р.У.*Рэйган* (1981—89), Дж.*Буш*-старэйшы (1989—93), Дж.Буш-малодшы (з 2001). Партыя не мае пастаянных членства, праграмы і статута. Раз у 4 гады (перад прэзідэнцкімі выбарамі) склікаецца парт. з'езд, які прымае праграму, выбірае кандыдатаў на пасады прэзідэнта і віцэ-прэзідэнта ЗША; бягучую парт. дзейнасць каардынуе Нац. к-т (штаб-кватэра ў Вашынгтоне). Сімвал партыі — выява слана.

Літ.: Никонов В.А. От Эйзенхауэра к Никсону: Из истории Респ. партии США. М., 1984; Яго ж. Республиканцы: от Никсона к Рейгану. М., 1988.

РЭСПУБЛІКА́НСКАЯ ПА́РТЫЯ ПРА́ЦЫ І СПРАВЯДЛІ́ВАСЦІ, палітычная партыя ў Рэспубліцы Беларусь. Створана ў чэрв. 1993. Вышэйшы орган паміж з'ездамі — Палітвыканком. Асн. мэта — стварэнне грамадства эканам. дабрабыту і сац. справядлівасці. Выступае за прафесійны парламент, прэзідэнцкую форму праўлення, мясц. самакіраванне і незалежную судовую ўладу. Партыя лічыць, што ў грамадстве павінна атрымаць развіццё змешаная эканоміка, якая прадугледжвае наяўнасць дзярж. і прыватнай форм уласнасці. У агр. сферы прадугледжвае свабоднае развіццё разнастайных форм гаспадарання і ўласнасці. Выступае за эканам. і знешнепаліт. саюз з Расіяй. Асн. сац. база партыі — людзі фіз. і разумовай працы, навучэнцы, пенсіянеры і інваліды. Друкаваны орган — «*Цэнтральная газета*» (з 1994). На 1.1.2001 дзейнічалі 9 гар., 16 раённых і 131 пярвічная арг-цыі партыі, якія аб'ядноўвалі 1524 чал.

РЭСПУБЛІКА́НСКАЯ ПА́РТЫЯ РАДЫКА́ЛАЎ І РАДЫКА́Л-САЦЫЯЛІ́СТАЎ (Parti républican radical et radical-socialiste), найстарэйшая франц. паліт. партыя. Як паліт. плынь існавала з 1869, як паліт. партыя аформілася ў 1901. Адлюстроўвала інтарэсы сярэдніх колаў франц. горада і вёскі. Адыгрывала значную ролю ў паліт. жыцці Францыі перыяду Трэцяй рэспублікі (да 1940), да яе належалі найбуйнейшыя тагачасныя палітыкі, у т.л. Ж.Клемансо, Э.Эрыо, Э.Даладзье. У 1935—38 уваходзіла ў Народны фронт. Мела значны ўплыў у паліт. жыцці Чацвёртай рэспублікі (1947—58), удзельнічала ў большасці ўрадаў. Пасля абвяшчэння Пятай рэспублікі (1958) страціла сваё значэнне ў паліт. жыцці.

РЭСПУБЛІКА́НСКАЯ СТУ́ДЫЯ ТЭЛЕБА́ЧАННЯ. Пачала рэгулярнае вяшчанне з 1.1.1956 у Мінску. Напачатку Мінскі тэлецэнтр меў часовую студыю, разлічаную на аднапраграмнае вяшчанне з сярэднясутачным аб'ёмам 6 гадз, радыус дзеяння каля 60 км. У ліп. 1957 арганізавана перадача з дапамогай перасоўнай тэлевізійнай станцыі. У 1958—69 уведзены ў дзеянне тэлецэнтры ў Гомелі, Віцебску, Брэсце, Гродне. З 1962 пачалося вяшчанне па 2, з 1972 — па 3 праграмах. У 1962 адбыўся выхад бел. тэлебачання на Інтэрбачанне. У 1965 на Мінскім тэлецэнтры пачаў працаваць відэамагн. запіс. З вер. 1974 Р.с.т. стала рэгулярна ўключаць у праграму каляровыя перадачы ўласнай вытв-сці, з 1981 пачала працаваць на самаст. канале, адбыўся поўны пераход рэсп. вяшчання на каляровы стандарт. У склад Р.с.т. ўваходзяць інфарм. агенцтва і 6 дырэкцый: вяшчання 1-га нац. канала; маст.; спарт.; грамадска-паліт.; перспектыўнага вяшчання; спец. праектаў. Як сродак электроннай масавай інфармацыі, прапаганды і камунікацыі, асветы, выхавання, арганізацыі вольнага часу насельніцтва функцыянуе ў адпаведнасці з прынцыпамі праграмнага планавання, дакументальна зафіксаванымі ў т.зв. сетцы эфірнага вяшчання. Яна прадугледжвае перыядычнасць выхаду цыклавых праграм, збалансаванасць відаў вяшчання (інфарм., сац., пазнавальнага, спарт., маст., забаўляльнага), размеркаванне перадач на працягу дня ў адпаведнасці з узростам, сац. і прафес. катэгорыямі гледачоў, а таксама рэйтынгам тэлепрадукцыі. Паводле структуры тэлевізійнае вяшчанне падзяляецца на ўласнае (падрыхтаванае супрацоўнікамі бел. тэлебачання) і мясц. (агульны аб'ём прадукцыі, што выходзіць на экран: уласнае вяшчанне, заказное, дэманстрацыя тыражаваных кінафільмаў, паўторы перадач, спектакляў, канцэртаў і інш.). У канцы 1997 распрацавана і прынята канцэпцыя пад дэвізам «Зямля пад белымі крыламі», у якой вызначаны асн. кірункі палітыкі вяшчання нац. канала. Р.с.т. прымае ўдзел у ажыццяўленні праектаў — Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь, тэлефестываль бел. песні «На скрыжаваннях Еўропы», рэсп. фестываль камернай музыкі «Музы Нясвіжа», Маладзечанскі фестываль песні і паэзіі, фестываль-кірмаш «Дажынкі», міжнар. фестывалі «Славянскі базар», «Залаты шлягер» і спец. акцыі, прысвечаных юбілейным датам і інш. Перадачы бел. тэлебачання поўнасцю ахопліваюць тэр. Беларусі. На 2001 адзіная праграмная сетка мае 6 тэлецэнтраў і 23 рэтранслятары. Р.с.т. ўваходзіць у склад *Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь*. *Л.А.Барадзіна.*

РЭСПУБЛІКА́НСКІ ВЫ́СТАВАЧНЫ ЦЭНТР. Адкрыты ў 1968 у Мінску як Выстаўка дасягненняў нар. гаспадаркі Беларусі, з 1992 — Р.в.ц. Праводзіў міжнар. выстаўкі-кірмашы дасягненняў вытв-сці, навукі і тэхнікі, прагрэс. тэхналогій, лепшых узораў тавараў Беларусі і замежных краін. Экспазіц. пл. 4,5 тыс. м^2, адкрытая пляцоўка для вялікагабарытных экспанатаў. З 1999 адзін з павільёнаў *Нацыянальнага выставачнага цэнтра «Белэкспа»*, які валодае ўсімі неабходнымі ўмовамі для правядзення міжнар. мерапрыемстваў.

РЭСПУБЛІКА́НСКІ ГІДРАМЕТЭАРАЛАГІ́ЧНЫ ЦЭНТР Дзяржаўнага камітэта па гідраметэаралогіі Рэспублікі Беларусь, Гідраметцэнтр, навукова-вытворчая ўстанова. Засн. ў Мінску ў 1969 на базе Мінскай гідраметэаралагічнай абсерваторыі і Бюро прагнозаў. Асн. кірункі работы: складанне метэаралагічных, аграметэаралагічных і гідралагічных прагнозаў на тэр. Беларусі, правядзенне комплексных гідраметэаназіранняў у Мінску, ажыццяўленне кіраўніцтва гідраметэаралагічнымі станцыямі і абсерваторыямі, правядзенне н.-д. работ па вывучэнні аграметэаралагічнага рэжыму і распрацоўцы рэгіянальных методык прагнозаў, збор аператыўнай гідраметэаралагічнай інфармацыі, выданне даведнікаў, штогоднікаў і інш. матэрыялаў па аграгідраметэаралагічным рэжыме.

РЭСПУБЛІКА́НСКІ КАЛЯНДА́Р, рэвалюцыйны каляндар, уведзены ў перыяд *Французскай рэвалюцыі 1789—99* дэкрэтам Нац. канвента ад 5.10.1793. Р.к. адмяніў хрысц. летазлічэнне і ўстанавіў новую эру (першы дзень — дзень абвяшчэння рэспублікі — 22.9.1792). Год падзяляўся на 12 месяцаў, па 30 дзён кожны, месяц — на 3 дэкады. Пасля 360 дзён уводзіліся 5 (у высакосныя гады 6) «дадатковых» дзён («санкюлатыды»). Дзесяты дзень і ўсе дадатковыя лічыліся днямі адпачынку і рэв. свят. Месяцы атрымалі новыя назвы, у якіх улічваліся асаблівасці пары года: асеннія (вандэм'ер, брумер, фрымер), зімовыя (нівоз, плювіёз, вантоз), веснавыя (жэрміналь, флярэаль, прэрыяль), летнія (месідор, тэрмідор, фруктыдор); зменены таксама назвы дзён тыдня. Р.к. дзейнічаў да 1.1.1806, калі ў перыяд напалеонаўскай *Першай імперыі* зноў быў заменены грыгарыянскім календаром (гл. *Новы стыль*). Р.к. быў узноўлены ў час *Парыжскай камуны 1871* і дзейнічаў з 18 сак. па 28 мая 1871, пасля чаго адноўлены грыгарыянскі каляндар. Гл. таксама *Каляндар* і літ. пры ім.

РЭСПУБЛІКА́НСКІ ПАЛА́Ц КУЛЬТУ́РЫ ПРАФСАЮ́ЗАЎ. Пабудаваны ў 1954 (арх. У.Яршоў) у Мінску на праспекце Ф.Скарыны ў духу неакласіцызму. Да 1998 наз. Палац культуры Белсаўпрофа. Гал. фасад, вырашаны ў выглядзе 10-калоннага порціка, увянчанага франтонам са скульпт. групамі (скульпт. В.Папоў, А.Глебаў, С.Селіханаў), арыентаваны на Кастрычніцкую плошчу. Прамавугольны ў плане будынак мае строга сім. аб'ём, па перыметры абрамлены калонамі і паўкалонамі карынфскага ордэра. Знутры порцік аздоблены кесонным скляпеннем. Аналагічна вырашаны тыльны фасад. Над складаным

карнізам бакавых фасадаў па 3 франтоны, упрыгожаныя пінаклямі. Разнастайныя дэкар. элементы класічнай спадчыны выкарыстаны ў інтэр'ерах залаў — глядзельнай (на 670 месцаў), танц. і лекцыйнай, у фае, холах. У палацы працуюць выяўл. студыя, школы эстэт., інтэлектуальна-лагічнага выхавання, гурткі замежных моў і інш.; нар. калектывы (хар. капэла, ансамблі танца «Вясёлка», узорны — «Равеснік», сімф. арк. «Рычыкар», т-р гульні «Вечнае дзяцінства» і інш.). *А.А.Воінаў.*

Рэспубліканскі палац культуры прафсаюзаў.

РЭСПУБЛІКА́НСКІ ТЭА́ТР БЕЛАРУ́СКАЙ ДРАМАТУРГІ́І. Створаны ў снеж. 1990 у Мінску як падраздзяленне Бел. т-ра імя Я.Купалы па рабоце з драматургамі. З 1993 атрымаў статус рэсп. т-ра і сучасную назву. Заснавальнік і першы маст. кіраўнік т-ра В.*Мазынскі.* З вер. 2000 т-р узначальвае В.*Анісенка.*

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі. Сцэна са спектакля «Апошняя пастараль» А.Адамовіча.

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі. Сцэна са спектакля «Галава» І.Сідарука.

Гал. мастак В.Цімафееў (да 2000). З вер. 1994 працуе з пастаяннай трупай, сфарміраванай з выпускнікоў акцёрскага аддзялення Бел. АМ (маст. кіраўнік Мазынскі). Спектаклі ідуць на бел. мове. Першы спектакль — «Ку-ку» М.Арахоўскага. Т-р аддае перавагу творам пачынаючых драматургаў, у рабоце з якімі выкарыстоўваюцца індывідуальныя формы, праводзяцца семінары, сцэн. чытанні п'ес па ролях і інш. Найб. ўвагу надае фарміраванню бел. рэпертуару: «Барбара Радзівіл» Р.Баравіковай, «Галава» І.Сідарука, «Нагавіцы святога Георгія» і «Чорны квадрат» М.Клімковіча і М.Адамчыка, «Паваліўся нехта» У.Галубка і Л.Родзевіча, «Містэр Розыгрыш» С.Кандрашова, «Пеўчыя» Г.Марчука, «Заложніца кахання» і «Стомлены д'ябал» С.Кавалёва, «Дзіця з Віфлеема» М.Пінігіна, «Апошняя пастараль» А.Адамовіча, «Развітанне з Радзімай» А.Паповай і інш. Сярод твораў рус. і замежнай класікі: «Рычард III» і «Макбет» У.Шэкспіра, «Лекар паняволі» Мальера, «Узлёт Артура Уі, які можна было спыніць...» Б.Брэхта, «Шампань-скага!» паводле А.Чэхава («Прапанова», «Юбілей») і інш. Рэпертуар вызначаецца жанравай разнастайнасцю: фарс-абсурд, камедыя жахаў, паэт. драма, прытча, сцэны з рыцарскіх часоў, фарс-рэпетыцыя; асветніцкі спектакль для старэйшых школьнікаў («Бог Дыяніс — тэатра Бог» — І.Чаркаса). Спектаклі ставілі і ставяць рэжысёры А.Гарцуеў, А.Гузій, М.Дзінаў (Гавядзінаў), У.Осіпаў, Пінігін, В.Растрыжэнкаў, Т.Сулімава, Р.Таліпаў. Значны ўклад у дзейнасць т-ра Т.*Мархель.* *І.І.Чаркас.*

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі. Сцэна са спектакля «Стомлены д'ябал» С.Кавалёва.

РЭСПУ́БЛІКІ ПАЛА́Ц у Мінску. Пабудаваны ў 1986—2001 (кіраўнік праекта М.Пірагоў, арх. В.Данілаў, Л.Зданевіч, А.Шабалін, канструктары Я.Уласаў, А.Яршова) на Кастрычніцкай пл., на перасячэнні 2 асн. дыяметраў горада — водна-зялёнай сістэмы поймы р. Свіслач і праспекта Скарыны. Размяшчэнне будынка на гал. кампазіцыйнай восі плошчы вызначыла строгую сіметрычнасць яго аб'ёмна-планіровачнай структуры. Вобразнае вырашэнне палаца засн. на прасторавай будове фасадаў. На першым плане — строй пілонаў перыптэра, які нясе ўсё пакрыццё будынка памерам 109,5 × 82,5 м. Другі план фасадаў у выглядзе рытмічнага спалучэння каменных сцен з вітражом; верхняя зона другога плана — зашклёны вітраж, які апяразвае будынак па перыметры і ступеньчата апускаецца да адзнакі подыума на гал. фасадзе, чым падкрэслівае аб'ём гал. і абыходнага фае. Арх.-планіровачная структура палаца грунтуецца на дакладным функцыянальным заніраванні асн. груп памяшканняў, зручных верт. і гарыз. сувязях. Р.п. складаецца з памяшканняў: комплексы глядзельных вял. залы (на 2700 месцаў), малых залаў (агульная колькасць месцаў 800; канферэнц-залы,

прэс-цэнтр, кавярня з барам і інш.); сцэнічны, блокі ўрадавы і прэзідыума; 3-павярховы кінакомплекс, залы канды-цыянераў, венткамер, дапаможныя і тэхн. памяшканні. У зоне подыума комплекс грамадска-культ. прызначэння: більярдны клуб з гульнявой арэнай, барам, маст. галерэя, кавярня. У гал. фае адкрытыя парадныя лесвіцы, 6 эскалатараў забяспечваюць сувязь паміж усімі ўзроўнямі фае і кулуараў. Р.п. мае падземны інж. корпус (аб'ём 25 тыс. м^3; знаходзіцца паміж палацам і музеем Вял. Айч. вайны). Маст. афармленне інтэр'ераў вырашана ў бела-залацістых тонах, арыгінальнасцю і багаццем вызначаюцца сістэма дэталёвага дакумент. даследавання помніка (апісанні, фотафіксацыя, абмерныя чарцяжы, археал., гіст., інж.-тэхн.) і навукова абгрунтаванага праектнага рашэння з фіксацыяй усіх змен.

У працэсе Р. могуць уводзіцца новыя элементы, неабходныя па эстэт. і канстр. меркаваннях, ужываюцца новыя матэрыялы, тэхніка і тэхналогіі, якія не парушаюць цэласнасці помніка і яго гіст. рыс. Метады і спосабы Р. вызначаюцца характарам далейшага існавання помніка: *кансервацыя*, аднаўленне (адбудова), прыстасаванне, *рэканструкцыя*, уласна Р., перанясенне (з поўнай разборкай помніка або без яе), рэгенерацыя (комплекс горадабуд. і рэстаўрацыйных работ па захаванні гіст. забудовы і ансамбляў). Мэта Р. твораў выяўл. і



Інтэр'ер **Рэспублікі палаца**.

кар.-асвятляльных элементаў (маст. В.Даўгала, Ю.Івахнішын, У.Стальмашонак, В.Чайка), габелены (маст. Л.Бартлаў, В.Грыдзіна, Г.Крываблоцкая, В.Крывашэева, В.Маркавец-Бартлава, Н.Пілюзіна). У Р.п. праводзяцца грамадска-паліт. мерапрыемствы гар., рэсп. і міжнар. значэння, кангрэсы, сімпозіумы, выстаўкі, канцэрты, конкурсы, спектаклі, выступленні оперных і балетных калектываў. Іл. гл. таксама да арт. *Плошча*.

Літ.: Шамрук А. Каб удыхнуць у архітэктуру жыццё // Мастацтва. 2001. №2.

РЭСТАЎРА́ЦЫЯ (ад позналац. restauratio аднаўленне), 1) у шырокім сэнсе — аднаўленне чаго-н. у першапачатковым (ці блізкім да першапачатковага) выглядзе. 2) Р. ў архітэктуры і мастацтве — умацаванне і аднаўленне разбураных, пашкоджаных або скажоных помнікаў гісторыі і культуры (арх. збудаванняў, твораў выяўл. і дэкар.-прыкладнога мастацтва, археал. знаходак і інш.); састаўная ч. *аховы гісторыка-культурнай спадчыны*. Праводзіцца з мэтай выяўлення і аднаўлення іх гіст. і маст. каштоўнасці, падаўжэння іх веку і ўключэння ў сучаснае жыццё на аснове дэкар.-прыкладнога мастацтва — умацаванне і раскрыццё ад скажаючых напластаванняў. Р. папярэднічае вывучэнне прычын і відаў разбурэнняў аб'ектаў (спектральны, храматаграфічны, мікракрышт. і інш. аналізы, рэнтгенаграфаванне, макра- і мікрафатаграфаванне і г.д.). У працэсе Р. праводзіцца структурнае ўмацаванне твораў з выкарыстаннем роднасных ці спец. сінт. матэрыялаў, выпраўляюцца іх дэфармаваныя часткі, аднаўляюцца ці выдаляюцца хім. зменлівыя элементы, часткова ці поўнасцю выдаляюцца пазнейшыя дапаўненні. Розніца мясц. умоў, традыцый, мэт і ўзроўню Р. вызначае разнастайнасць яе тэарэт. канцэпцый у розных рэгіёнах. Першыя прыклады Р. помнікаў архітэктуры мелі выпадковы характар. У 19 ст. склаўся навук. падыход да Р. (арка Ціта ў Рыме, 1 ст. н.э., рэстаўрыравана ў 1821; Дзмітрыеўскі сабор 12 ст. ў г. Уладзімір, Расія, рэстаўрыраваны ў 1834—43).

На Беларусі першыя навук. Р. гіст. помнікаў арганізаваны ў канцы 19 — пач. 20 ст. членамі камісіі Рус. археал. т-ва У.В.Суславым (Камянецкая вежа 13 ст.) і П.П.Пакрышкіным (Сафійскі сабор 11 ст. ў г. Полацк). У 1920—30-я г. ў Зах. Беларусі праведзена Р. помнікаў архітэктуры: Стары замак 14—16 ст. ў Гродне, палац 18 ст. ў в. Свяцк Гродзенскага р-на, кальвінскі збор 16 ст. ў г. Смаргонь, касцёл 16 ст. ў в. Гнезна Ваўкавыскага р-на. Значныя рэстаўрацыйныя работы праведзены пасля разбурэнняў у Вял. Айч. вайну. Спецыфічнасць помнікаў архітэктуры і мастацтва Беларусі (шматразовыя разбурэнні, перабудовы і наслаенні розных эпох і стыляў, асаблівасці ўздзеяння на помнікі кліматычных умоў, недаўгавечнасць іх асн. матэрыялаў) ускладняе іх Р. З 1968 Р. помнікаў вялі Спец. навук.-рэстаўрацыйныя вытв. майстэрні, з 1985 — вытв. аб'яднанне «Белрэстаўрацыя». У 1991 утворана Гал. ўпраўленне па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры пры СМ Беларусі, у 1996 яно рэарганізавана ў Камітэт па кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў пры Мін-ве культуры Беларусі. Сярод найб. значных навук. Р. помнікаў: архітэктуры — Спаса-Праабражэнская царква 16 — пач. 17 ст. ў г. Заслаўе, касцёл 19 ст. ў в. Раўбічы Мінскага р-на; Слуцкая брама 17—18 ст. ў г. Нясвіж, манастыр базыльянак 18 ст. і рэшткі Прачысценскай царквы 12 ст. ў Гродне, Сафійскі сабор у г. Полацк (рэшткі храма 11 ст., дэкор 18 ст. і інш.), будынкі філіялаў Літ. музея Я.Купалы ў в. Вязынка Маладзечанскага р-на і Літ. музея Я.Коласа ў в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага р-на; гісторыі — дом-музей Э.Ажэшкі 19 ст. ў Гродне; манум. жывапісу — размалёўка абл. б-кі імя Я.Ф.Карскага і сграфіта на фасадах касцёла брыгітак 17 ст. ў Гродне, размалёўка Успенскага касцёла ў г. Мсціслаў. Рэстаўрыруюцца старадаўні жывапіс і скульптура, керамічныя і ювелірныя вырабы, мэбля, муз. інструменты, старадрукі і інш. (захоўваюцца ў Нац. маст. музеі Беларусі, Нац. музеі стараж.-бел. культуры Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі і інш.). 3) Р. ў палітыцы — аднаўленне ранейшага, звергнутага паліт. ладу.

Літ.: Выгонная А.А., Калнин В.В., Цейтлина М. М. Основы реставрации памятников архитектуры, монументальной и станковой живописи. Мн., 2000. *В.В.Калнін.*

РЭСТАЎРА́ЦЫЯ ў Францыі, перыяд другога праўлення дынастыі *Бурбонаў*, скінутых з каралеўскага прастола ў выніку *Французскай рэвалюцыі 1789—99*. Адрозніваюць 1-ю (1814—15) і 2-ю (1815—30) Р., аддзеленыя паміж сабой перыядам «*Ста дзён*». Дваранска-клерыкальны рэжым Р. канчаткова ліквідаваны ў выніку *Ліпеньскай рэвалюцыі 1830*.

РЭСТРЫ́КЦЫЯ (ад позналац. restrictio абмежаванне), абмежаванне манаполіямі вытв-сці, продажу і экспарту тавараў з мэтай павышэння цэн і атрымання звышпрыбыткаў; абмежаванне цэнтр. банкам дзяржавы памераў *крэдыту* камерцыйным банкам з мэтай стрымлівання *інфляцыі*.

РЭСТЫТУ́ЦЫЯ (лац. restitutio аднаўленне), 1) у цывільным праве —

вяртанне бакамі, якія заключылі здзелку, усяго атрыманага па здзелцы ў выпадку прызнання яе несапраўднай. Пры немагчымасці вярнуць атрыманае ў натуры кампенсуецца яго кошт у грашах, калі інш. вынікі несапраўднасці здзелкі не прадугледжаны ў законе. Агульным правілам з'яўляецца двухбаковая Р. — кожны з бакоў вяртае другому ўсё атрыманае па здзелцы, а пры немагчымасці гэта зрабіць вяртае яго кошт у грашах. 2) У міжнародным праве — вяртанне маёмасці, неправамерна захопленай і вывезенай адным з ваюючых бакоў з тэр. другой дзяржавы, якая з'яўлялася яго ваен. праціўнікам. Міжнар.-прававыя акты, прынятыя ў перыяд і пасля заканчэння 2-й сусв. вайны, прадугледжвалі вяртанне ў парадку Р. дзяржавам, якія падвергліся нападу і акупацыі фаш. Германіяй і яе саюзнікамі, матэрыяльных каштоўнасцей, захопленых і незаконна вывезеных з часова акупіраваных тэрыторый. *Э.І.Кузьмянкова.*

РЭСТЫТУ́ЦЫЯ ў біялогіі, аднаўленне арганізма і яго частак (органа, тканкі, клеткі) пасля пашкоджання. Па меркаванні адных вучоных, *рэгенерацыя* і рэпарацыя (аднаўленне пашкоджанняў у малекулах дэзоксірыбануклеінавай к-ты) — разнавіднасці Р.; па меркаванні другіх, Р. — рэгенерацыя ўсяго арганізма з невял. яго часткі (напр., з перадротавага ўчастка цела *немертыны* можа аднавіцца цэлы чарвяк). У раслін рэстытуцыйныя ўтварэнні адрозніваюцца ад ч. арганізма, якая засталася, і ад аднятай (напр., калі аддзяляюць ч. ліста, то можа ўзнікнуць новая ліставая пласцінка або лейкападобны ліст з чаранком). Р. ў медыцыне — поўная рэгенерацыя (замена дэфекту раўнацэннай тканкай), а няпоўная рэгенерацыя — субстытуцыя.

РЭСУ́РС (ад франц. ressource дапаможны сродак) тэхнічны, напрацоўка вырабу (машыны, тэхн. сістэмы) да дасягнення гранічнага стану, пры якім яго далейшая эксплуатацыя немагчыма, непажадана (з-за паніжэння эфектыўнасці) або небяспечна. Колькасна ацэньвае *даўгавечнасць* вырабу, яго *надзейнасць*. Выражаецца ў гадах, гадзінах, кіламетрах, гектарах, колькасці ўключэнняў і інш. Бывае поўны (за ўвесь тэрмін службы да канца эксплуатацыі), дарамонтны, міжрамонтны, выкарыстаны, астаткавы. Завязаны з *безадказнасцю*.

РЭСУ́РСЫ, сукупнасць прыродных, сацыяльных, духоўных магчымасцей, сродкаў і даходаў, якія могуць быць выкарыстаны ў працэсе стварэння матэрыяльных даброт і каштоўнасцей (*тавараў, паслуг* і інш.). Адрозніваюць Р. прыродныя, матэрыяльныя, працоўныя і фінансавыя. Прыродныя Р. — частка прыродных багацяў, прыдатная для выкарыстання ў вытв-сці або для задавальнення патрэб людзей. Да іх адносяцца: зямля, вада, атмасфера, карысныя выкапні, раслінны і жывёльны свет, натуральныя крыніцы энергіі (сонца, вецер, прылівы і адлівы, унутрызямное цяпло і інш.). Падзяляюцца на вычарпальныя і невычарпальныя; вычарпальныя бываюць узнаўляльныя ці неўзнаўляльныя. Матэрыяльныя Р. — сукупнасць сродкаў і прадметаў працы, якія прызначаны для выкарыстання ў працэсе вытв-сці (машыны, абсталяванне, сыравіна, матэрыялы, паліва, энергія і інш.). Працоўныя Р. — частка насельніцтва, здольная да мэтазгоднай прац. дзейнасці. Фінансавыя Р. — грашовыя сродкі, якія грамадства мае магчымасць выкарыстоўваць. Сродкі, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе стварэння матэрыяльных даброт або інш. каштоўнасцей, наз. фактарамі вытв-сці (зямля, праца, капітал, прадпрымальніцтва). У якасці спецыфічных фактараў вытв-сці вылучаюць навуку і інфармацыю. *У.Р.Залатагораў.*

РЭСУ́РСЫ НАТУРА́ЛЬНЫЯ, тое, што *прыродныя рэсурсы*.

РЭТАРАМА́НСКАЯ МО́ВА, адна з *раманскіх моў*. Пашырана ў Швейцарыі і на ПнУ Італіі. Нац. мова Швейцарыі (разам з ням., франц. і італьян. мовамі). Мае 3 асн. дыялекты: граўбюндэнскі, ладзінскі і фрыульскі. Па пераважнай большасці прыкмет належыць да зах.-раманскіх моў (напр., захаванне канцавога -s, азванчэнне інтэрвакальных k, p, t), але некат. асаблівасці набліжаюць яе да *румынскай мовы* (напр., займеннікавая сістэма). Характэрны высокі ўзровень архаічнасці і варыятыўнасці форм, сляды моцнага ўплыву італьян. і ням. моў, асабліва ў фанетыцы і лексіцы. Пісьменства з 14 ст. на аснове лацінскага алфавіта (фрыульскі дыялект).

Літ.: Бородина М.А. Современный литературный ретороманский язык Швейцарии. Л., 1969. *У.В.Макараў.*

РЭТАРДА́НТЫ (ад лац. retardo затрымліваю, запавольваю), форма *пестыцыдаў*, якія прыгнечваюць рост сцёблаў і парасткаў і надаюць раслінам устойлівасць да палягання. Павышаюць эфектыўнасць інш. аграпрыёмаў і ўраджайнасць збожжавых культур, зніжаюць страты прадукцыі ў час збору і захавання. Выкарыстоўваюцца ў выглядзе растворaў, сумяшчаюць з інш. пестыцыдамі і пазакаранёвымі падкормкамі мікраэлементамі. Найб. пашыраныя Р.: хлорхалінхларыд (прадухіляе паляганне азімай пшаніцы, павялічвае выхад насеннай прадукцыі шматгадовых злакавых траў, паляпшае якасць расады памідораў, паскарае плоданашэнне яблынь, абмяжоўвае рост вусоў суніцы); кампазан (прадухіляе паляганне азімага жыта, ячменю, лёну-даўгунцу); гідрэл (прадухіляе прарастанне клубняў бульбы пры захоўванні) і інш.

Л.В.Круглоў.

РЭТАРДА́ЦЫЯ СЕКСУА́ЛЬНАЯ (лац. retardatio спазненне, затрымка), затрымка псіхасексуальнага развіцця — адставанне тэмпу палавога развіцця ад адпаведнага ўзросту дзіцяці. Вылучаюць Р.с. саматагенную, псіхагенную і сацыягенную. Саматагенная мае біял. аснову і звязана з адставаннем у развіцці першасных і другасных палавых адзнак. Значныя расстройствы эндакрыннай сістэмы могуць прывесці да поўнага выпадзення сексуальных кампанентаў у псіхічным развіцці асобы. Псіхагенная Р.с. выклікаецца рознымі парушэннямі псіхікі, агульным адставаннем псіхічнага развіцця. Сацыягенная Р.с. назіраецца пры няправільным палавым выхаванні. Пераважна бывае спалучэнне некалькіх варыянтаў Р.с.

РЭТО́РСІІ (ад позналац. retorsio адваротнае дзеянне), правамерныя прымусовыя дзеянні дзяржавы, якія робяцца ў адказ на недружалюбны акт інш. дзяржавы, што паставіла ў дыскрымінацыйныя ўмовы фіз. або юрыд. асоб першай дзяржавы (напр., абмежаванне правоў іншаземцаў — грамадзян інш. дзяржавы, павелічэнне мытных пошлін гэтай дзяржавы). Мае на мэце аднаўленне прынцыпу ўзаемнасці ў адносінах адпаведных дзяржаў. Меры, што выкарыстоўваюцца ў якасці Р., павінны быць прапарцыянальна адпаведнымі акту, які іх выклікаў, і спыняюцца з моманту аднаўлення ранейшага становішча. Як і *рэпрэсаліі*, Р. не прадугледжваюць выкарыстання ўзбр. сілы.

РЭ́ТРА (ням. Rethra, слав. Радыгашч, Радгашч), рэлігійны цэнтр і ўмацаванне 10—11 ст. прыбалт. зах.-слав. племя радарыяў (ратараў, ратран), якое ўваходзіла ў саюз плямён *люіцічаў*; цяпер — гарадзішча каля г. Фельдберг (Германія). У 1068 разбурана войскамі епіскапа Бурхарда II Гальберштацкага, а ў пач. 12 ст. — імператарам Лотарам III. Звесткі аб Р. сучаснікаў-храністаў Адама Брэменскага і Цітмара Мерзебургскага пацверджаны раскопкамі ням. археолага К.Шухарта (1922). Р. была абкружана 2 земляными валамі з 3 вял. і 3 малымі вежамі з брамамі. У цэнтры быў драўляны храм бога сонца і агню Радагаста, ці Сварожыча. Каля храма выяўлены рэшткі 10 жылых пабудоў.

РЭТРАГРА́Д (ад лац. retrogradus які ідзе назад), праціўнік сацыяльнага і культурнага прагрэсу, чалавек з адсталымі поглядамі, якога наз. таксама рэакцыянерам (напр., доказ рэтраграда, рэтраградскі погляд).

РЭТРАНСЛЯ́ТАР (ад *рэ...* + лац. translator пераносчык), апарат ці электраправоднае асяроддзе для *рэтрансляцыі* радыёсігналаў; прамежкавы пункт лініі *радыёсувязі*. Актыўны Р. — прыёмна-перадавальная радыёстанцыя (гл. *Радыёрэлейная станцыя*). Пасіўны Р. — пояс метал. іголак на каляземнай арбіце, іанізаваная пара металаў, ШСЗ ці мех. канструкцыя пэўнай формы (напр., плоскі адбівальнік, люстраная антэна), здольныя рассейваць або накіравана адбіваць радыёхвалі. Можа абслугоўваць радыёсетку з многіх ліній

сувязі з рознымі частотамі радыёсігналаў.

РЭТРАНСЛЯ́ЦЫЯ, прыём радыёсігналаў на прамежкавых пунктах *радыёрэлейнай лініі* сувязі для ўзмацнення і далейшай перадачы іх з дапамогай *рэтранслятараў*. Адрозніваюць Р. з узмацненнем без пераўтварэння і рэгенератыўную Р. — з пераўтварэннем сігналаў і выпраўленнем скажэнняў, якія ўзніклі пры перадачы.

РЭТРАСПЕ́КЦЫЯ (ад лац. retro назад+ + specio гляджу), 1) зварот да мінулага, аналіз падзей, якія адбываліся раней, з мэтай выяўлення ў іх зародкаў тэндэнцый, уласцівых сучаснасці. 2) Погляд на прагрэс. сац. з'явы, як на такія, якія ўжо існавалі раней. 3) Агляд інфармацыі за мінулыя гады (напр., рэтраспектыўная бібліяграфія, рэтраспектыўны пошук дакументаў, рэтраспектыўны фільм).

РЭ́ТУШ (франц. retouche ад retoucher падмалёўваць, падпраўляць, літар. — зноў датыкацца), выпраўленне выяў (малюнкаў, фотаздымкаў і інш.) шляхам прарысоўкі іх алоўкамі або фарбамі, выскрабання асобных участкаў або хім. апрацоўкі (траўленне эмульсіі фатаграфічнага слоя). Бывае тэхнічная (выдаленне выпадковых дэфектаў — кропак, плям, драпін) і градацыйная (узмацненне або аслабленне шчыльнасці асобных участкаў паўтонавай выявы). У паліграфіі Р. выкарыстоўваюць для падрыхтоўкі арыгіналаў да друку, выпраўлення негатываў і дыяпазітываў перад вырабам друкарскіх форм. Звычайна выконваюць уручную, на выявах вял. памераў — аэрографам.

РЭТЫКУЛАЦЫ́ТЫ (ад лац. reticulum сетачка + kytos клетка), бяз'ядзерныя постклетачныя структуры, якія папярэднічаюць утварэнню *эрытрацытаў*. У крыватоку за 24—28 гадз пераўтвараюцца ў спелыя эрытрацыты. Цытаплазма Р. амаль цалкам запоўнена *гемаглабінам*, мае ў сабе рэшткі полірыбасом і інш. арганел. У Р. ажыццяўляецца сінтэз бялку, пурынаў, ліпідаў і інш. У дарослага чалавека ў норме Р. у крыві 0,7—1% ад агульнай колькасці эрытрацытаў. Павелічэнне колькасці Р. (да 50% і больш) сведчыць пра недастатковасць пераносу кісларoду (бывае, напр., пры вял. стратах крыві). Р. менш за 0,5% ад агульнай колькасці эрытрацытаў — прыкмета прыгнечання іх утварэння. *А.С.Леанцюк.*

РЭТЫКУЛА-ЭНДАТЭЛІЯ́ЛЬНАЯ СІСТЭ́МА, тое, што *макрафагічная сістэма*.

РЭТЫКУЛЯ́РНАЯ ФАРМА́ЦЫЯ, сукупнасць нерв. структур, што размяшчаюцца ў спінным, прадаўгаватым, сярэднім мозгу, вароліевым мосце і ўтвараюць адзіны функц. комплекс. Філагенетычна стараж. сістэма рухальнага кантролю, добра развіта ў пазваночных жывёл і чалавека. Мае шматлікія *нейроны*, разгалінаваныя адросткі якіх ідуць ва ўзыходным і сыходным напрамках. Бесперапынную танічную актыўнасць нейронаў Р.ф. забяспечвае іх высокая хім. адчувальнасць да гумаральных фактараў і фармакалагічных рэчываў (барбітураты), а таксама сыходжанне (канвергенцыя) да іх нерв. (аферэнтных) імпульсаў з перыферыі арганізма. Узыходная танічная імпульсацыя Р.ф. рэгулюе дзейнасць кары вял. паўшар'яў, сыходная — спінальныя рухальныя цэнтры. Нейроны фармацыі звязаны з усімі органамі пачуццяў, рухальнымі і адчувальнымі абласцямі кары галаўнога мозга, таламусам, гіпаталамусам, спінным мозгам і выконваюць складаныя інтэгрыйна-каардынацыйныя функцыі. Дзейнасць Р.ф. кантралюецца карой вял. паўшар'яў. *А.С.Леанцюк.*

РЭТЫНІ́Т (ад позналац. retina абалонка сятчаткі), запаленне сятчаткі вока, якое прыводзіць да зніжэння вастрыні *зроку*. Пры Р. ўзнікае ненармальная светлавое адчуванне (бляск «маланкі» ў вачах і інш.), звужэнне палёў зроку. Часцей узнікае ад узбуджальніка бактэрыяльнага паходжання (стрэптакок, стафілакок, пнеўмакок) або вірусаў (грыпу, герпесу); бывае таксама пры туберкулёзе, сіфілісе і інш., зрэдку ад светлавога іанізавальнага выпрамянення, блізарукасці, пашкоджання сятчаткі вока. Адрозніваюць Р. туберкулёзны, метастатычны, сонечны, лепрозны і інш. Лячэнне комплекснае.

РЭ́УТ (Газдава-Рэут) Вінцэнты (Вікенцій Уладзіслававіч; 1812? — не пазней 1883), польскі і бел. пісьменнік; прадстаўнік рамантызму. Жыў у маёнтку Мосар у Полацкім пав. У 1827—34 чыноўнік у Віцебску. У 1839—42 полацкі павятовы прадвадзіцель дваранства (маршалак). Друкаваўся ў альманахах «Niezabudka» («Незабудка»), «Rocznik literacki» («Літаратурны штогоднік»), «Rubon» («Рубон»). Збіраў і публікаваў бел. фальклор, шырока выкарыстаў яго ў вершаванай аповесці «Жонка» (1844). У паэме «Летуценнік» (1849) выказаў сімпатыі да вызв. барацьбы грэч. народа. У публіцыст. артыкулах заклікаў развіваць на Беларусі прамысловасць. Прыхільна ставіўся да паўстання 1863—64, прыцягваўся да следства, быў пад наглядам паліцыі. Зрабіў запіс у «Альбоме» А.І.Вярыгі-Дарэўскага. У пісьме да І.Легатовіча расказаў пра сувязі беларусаў, якія жылі ў Пецярбургу, з Т.Шаўчэнкам.

Літ.: Зямкевіч Р. Тарас Шаўчэнка і беларусы // Тарас Шаўчэнка і беларуская літаратура. Мн., 1964; Кісялёў Г. Загадка беларускай «Энеіды». Мн., 1971; Яго ж. Радаводнае дрэва. Мн., 1994; Пачынальнікі. Мн., 1977; Inglot M. Polskie czasopisma literackie ziem litewsko-ruskich w latach 1832—1851. Warszawa, 1966. *Г.В.Кісялёў.*

РЭ́УТАЎ Алег Аляксандравіч (н. 5.9.1920, г. Макееўка Данецкай вобл., Украіна), расійскі хімік-арганік. Акад. Рас. АН (1964, чл.-кар. 1958). Скончыў Маскоўскі ун-т (1941), дзе і працуе з 1945 (з 1954 праф.), адначасова з 1962 у Ін-це элементаарган. злучэнняў Рас. АН. Навук. працы па хіміі металаарган. злучэнняў, даследаванні механізмаў гомалітычных і электрафільных рэакцый. Распрацаваў шэраг новых метадаў сінтэзу элементаарган. злучэнняў пры дапамозе оніевых злучэнняў (1951—65), агульны метад сінтэзу плаціна- і паладыйарган. злучэнняў узаемадзеяннем комплексаў гэтых металаў з ртуцьарган. злучэннямі. Стварыў высокаэфектыўны дэзінфекцыйны прэпарат дыяцыд. Адкрыў з'яву транс-умацавання сувязей у каардынацыйных злучэннях пераходных металаў (1974). Ленінская прэмія 1984.

Тв.: Механизмы реакций металлоорганических соединений. М., 1972 (разам з І.П.Бялецкай, В.І.Сакаловым).

Літ.: О.А.Реутов. М., 1970.

А.А.Рэутаў.

РЭУТЫЛІЗА́ЦЫЯ (ад *рэ*... + франц. utilisation ад лац. utilis карысны), паўторнае выкарыстанне раслінамі мінер. і нізкамалекулярных арган. рэчываў з аджылых і назапашвальных органаў у выніку іх транспарціроўкі па сітавідных трубках флаэмы да маладых растучых органаў. У працэсе Р. ўдзельнічаюць пераважна вугляводы і амінакіслоты (атрымліваюцца ў выніку распаду поліцукрыдаў і бялкоў) і элементы мінер. жыўлення (акрамя кальцыю і бору). У аднагадовых раслін Р. асабліва інтэнсіўна ідзе на позніх этапах антагенезу, пры выспяванні пладоў і насення. У шматгадовых раслін пластычныя рэчывы адцякаюць з лісця ў назапашвальныя органы (клубні, карані, сцёблы) перад лістападам, іх Р. пачынаецца пры руху сокаў наступнай вясной. Здольнасць расліны да Р. пэўнага мінер. элемента вызначаецца пры выключэнні яго з пажыўнай сумесі. Пры недахопе азоту, фосфару, калію, магнію раней пашкоджваецца старое лісце (высокая здольнасць да Р.); пры недахопе кальцыю, бору, жалеза, серы, марганцу, якія практычна не здольны да Р., пашкоджваюцца маладыя органы. Працэсы Р. выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы, напр., для паскарэння выспявання каробачак бавоўніку і інш.

РЭ́УЦКІ Уладзімір Рыгоравіч (н. 27.8.1937, ст. Звеннявы Бікінскага р-на Хабараўскага краю, Расія), бел. вучоны ў галіне фізіялогіі раслін. Д-р біял. н. (1985).

Скончыў Ленінградскую лесатэхн. акадэмію (1962). З 1969 у Ін-це эксперым. батанікі Нац. АН Беларусі (з 1990 заг. лабараторыі). Навук. працы па фізіялогіі воднага гамеастазу раслін, рухальных сілах і рэгуляцыі транспарту вады, асаблівасцях функцыянавання аквапарынаў, узаемасувязі воднага рэжыму і фотасінтэзу, водным стрэсе.

Тв.: Эколого-физиологические основы мелиорации почв агрофитоценозов. Мн., 1974 (разам з Л.П.Смаляком); Адаптациогенез процессов фотосинтеза в связи с водообеспеченностью растений (разам з Ж.І.Казловой) // Проблемы экспериментальной ботаники. Мн., 1997.

РЭЎВАЕНСАВЕ́Т РЭСПУ́БЛІКІ (РВСР), Рэвалюцыйны ваенны савет Рэспублікі (з 28.8.1923 Рэвалюцыйны ваенны савет СССР), калегіяльны орган вышэйшай ваен. улады ў 1918—34. Створаны 6.9.1918 паводле пастановы ВЦВК ад 2.9.1918 аб пераўтварэнні Сав. рэспублікі ў ваен. лагер. Аб'ядноўваў функцыі Вышэйшага савета, Наркамата па ваен. і марскіх справах і яго калегіі (члены калегіі ўвайшлі ў склад РВСР). Старшыня РВСР адначасова ўзначальваў Наркамат па ваен. і марскіх справах і зацвярджаўся ВЦВК РСФСР (з 1923 СНК СССР). РВСР кіраваў дзейнасцю ўсіх органаў ваен. ведамства, будаўніцтвам узбр. сіл, распрацоўваў планы па абароне краіны і інш. Яму падпарадкоўваліся ўсе органы і кіруючыя асобы ваен. ведамства: Галоўнакаманд. ўзбр. сіламі рэспублікі, Усерас. гал. штаб, Палявы штаб РВС Рэспублікі (з лют. 1921 — штаб РККА), Вышэйшая ваен. інспекцыя, Усерас. бюро камісараў (пазней Палітаддзел і Палітупраўленне РВСР) і інш. Скасаваны 20.6.1934.

Старшыні: Л.Д.Троцкі (6.11.1918—26.1.1925), М.В.Фрунзе (26.1.1925—31.10.1925), К.Я.Варашылаў (6.11.1925—20.6.1934). *С.А.Фамін.*

РЭЎВАЕНСАВЕ́ТЫ, Рэвалюцыйныя ваенныя саветы (РВС), вышэйшыя калегіяльныя органы ваен. улады і паліт. кіраўніцтва ў франтах, арміях, флатах і флатыліях у Сав. Расіі ў 1918—21 (на Д. Усходзе да ліст. 1922, у Сібіры да студз. 1923, на Зах. фронце да крас. 1924, у Сярэдняй Азіі да чэрв. 1926). Упершыню створаны на Усх. фронце паводле пастановы СНК ад 13.6.1918 у складзе каманд. фронтам і 2 камісараў. Прызначаліся з мэтай арганізацыі ваен. дзеянняў, кіраўніцтва, падрыхтоўкі і забеспячэння войск, парт.-паліт. і культ.-выхаваўчай работы. Мелі правы органаў сав. улады на тэр. дыслакацыі дадзенага аб'яднання; правадзіць мабілізацыю людскіх і матэрыяльных рэсурсаў на патрэбы фронту, забяспечваць рэв. парадак; у выпадку неабходнасці маглі ўмешвацца і адмяняць распараджэнні камандуючага і нават адлучаць яго ад пасады, аб чым павінны былі неадкладна рапартаваць вышэйстаячаму РВС. Непасрэдна РВС падпарадкоўваліся: штаб, рэв. ваен. трыбунал, палітаддзел, ваен. кантроль, нач. забеспячэння, нач. санітарнай службы і кіраўніцтва інспектараў родаў войск.

С.А.Фамін.

РЭЎКО́М, гл. *Рэвалюцыйны камітэт.*

РЭЎМАТЫ́ЗМ (ад грэч. rheumatismos выцяканне вадкасці), вострая рэўматычная ліхаманка, запаленне злучальнай тканкі з пераважнай лакалізацыяй працэсу у сардэчна-сасудзістай сістэме. Узнікае пры інфіцыраванні бэта-гемалітычным стрэптакокам групы А пераважна ва ўзросце 7—15 гадоў. Пры Р. развіваецца часовая і ўстойлівая непрацаздольнасць, часта фарміруюцца *парокі сэрца*.

Прыкметы Р.: ліхаманка, сімптомы пашкоджання сэрца (кардыт), суставаў (артрыт), сасудаў галаўнога мозга (малая харэя); больш рэдкія — кольцападобная эрытэма (бледнаружовая высыпка на скуры ў выглядзе тонкага кольцападобнага абадка) і падскурныя рэўматычныя вузельчыкі. Пры лячэнні праявы Р. праходзяць, акрамя пашкоджання сэрца (пасля рэўматычнай атакі, асабліва пры паўторных абвастрэннях можа фарміравацца парок сэрца). Лячэнне тэрапеўтычнае.

Літ.: Матвейков Г.П., Пшоник С.С., Милькаманович В.К. Ревматизм. Мн., 1979; Насонова В.А. Ревматизм — современное состояние вопроса // Клинич. медицина. 1991. Т. 69, № 5; Белов В.С. Острая ревматическая лихорадка // Рус. мед. журн. 1998. № 18. *М.Ф.Сарока.*

РЭФАРМА́ЦЫЯ (ад лац. reformatio пераўтварэнне), шырокі сац.-паліт. і ідэалаг. рух у Еўропе ў 16 ст., накіраваны супраць рымска-каталіцкай царквы і яе ролі ў паліт. сістэме грамадства; прывёў да ўзнікнення розных форм *пратэстантызму*. Ідэйнымі крыніцамі Р. былі *гуманізм* эпохі *Адраджэння* і сярэдневяковыя *ерасі*. Гуманісты выступалі з крытыкай сярэдневяковага светапогляду і абгрунтоўвалі прынцыпы бурж. індывідуалізму. Гал. месца ў ідэалогіі Р. займала вучэнне пра тое, што для выратавання душы верніка не патрабуецца пасрэдніцтва царквы, таму адмаўлялася неабходнасць яе існавання з усёй іерархіяй на чале з папам рымскім. Адзінай крыніцай веры было абвешчана Свяшчэннае пісанне — *Біблія*; адмаўлялася Свяшчэннае паданне (*патрыстыка*, прынятыя на царк. саборах заканадаўчыя акты, папскія пасланні, дэкрэты і інш.). Ідэолагі Р. патрабавалі адмены царк. дзесяціны і пышнага каталіцкага культу, секулярызацыі (адчужэння) царк. маёмасці (найперш зямельнай) на карысць дзяржавы і прыватных асоб, стварэння самаст. дэмакр. самакіравальных танных нац. цэркваў. Пачаткам Р. лічыцца выступленне 31.10.1517 праф. тэалогіі Вітэнбергскага ун-та ў Германіі М.*Лютэра*, у якім ён асудзіў гандаль папскімі *індульгенцыямі*. У ліку вядучых тэарэтыкаў Р. былі тэолагі У.*Цвінглі* і Ж.*Кальвін* (бюргерска-бурж. кірунак) і святар Т.*Мюнцэр* (сялянска-плебейскі кірунак).

На Беларусі Р. была абумоўлена глыбокімі сац.-гіст. прычынамі і паўплывала на ўсе бакі нар. жыцця. Гараджане імкнуліся вызваліцца ад феад. залежнасці, магнаты і шляхта разлічвалі захапіць багацце і зямельныя ўладанні царквы, гар. нізы і сялянства змагаліся супраць уціску свецкіх і царк. феадалаў, хоць сял. масы не прынялі шырокага ўдзелу ў рэфармацыйным працэсе. На фарміраванне Р. на Беларусі паўплывалі зах.-еўрап. гуманізм, гусіцкая ідэалогія, вучэнні правадыроў еўрап. Р. (асабліва *кальвінізму*), ідэі рус. вальнадумства. Першыя пратэстанцкія абшчыны ўзніклі да сярэдзіны 16 ст. У 1535 слуцкі кн. Ю.Алелькавіч выдзеліў зямельны ўчастак для лютэранскай царквы ў Слуцку. Але *лютэранства* не атрымала тут вял. пашырэння. У 1550-я г. ў духу кальвінізму рэфармаваны цэрквы ў Нясвіжы, Брэсце, Клецку, Ляхавічах, Койданаве, Навагрудку, пазней у Віцебску, Мінску, Полацку, Глыбокім, Івянцы, Оршы, Смаргоні і інш. Р. падтрымалі буйныя феадалы: Радзівілы, Кішкі, Сапегі, Хадкевічы, Тышкевічы і інш. У 1557 у Вільні адбыўся ўстаноўчы сінод пратэстанцкіх абшчын ВКЛ. Да 1560 рэфармацыйны рух на Беларусі набыў стройную кальвінісцкую арганізацыю, якая адрознівалася ад зах.-еўрап. кальвінізму большай цярпімасцю. Пры пратэстанцкіх абшчынах адкрываліся школы, шпіталі, друкарні. У 1560-я г. адбыўся раскол кальвінісцкага лагера. З яго вылучыўся радыкальна-рэфармацыйны кірунак — *антытрынітарыі* (прыхільнікі *арыянства*), якія крытыкавалі асновы феадалізму, падтрымлівалі патрабаванні нізоў. Пераемнікамі антытрынітарыяў былі *сацыніяне*. Своеасаблівасцю Беларусі было тое, што ў рэфармацыйным руху ўдзельнічалі і выхадцы з правасл. царквы. Пасля заключэння *Люблінскай уніі 1569* на Беларусі пачалося наступленне *Контррэфармацыі*, большасць магнатаў перайшла ў каталіцтва, што прадвызначыла згасанне Р. У 17 ст. большасць пратэстантаў была вымушана вярнуцца ў каталіцызм; тыя, што заставаліся пратэстантамі, абмяжоўваліся ў правах. У 1658 прынята пастанова соймавага суда аб выгнанні антытрынітарыяў з Рэчы Паспалітай. Р. актыўна ўздзейнічала на духоўныя працэсы. З ёю звязана фарміраванне бел. народнасці і станаўленне нац. самасвядомасці, пашырэнне кнігадрукавання, развіццё л-ры, асветніцкай дзейнасці. Р. падарвала аўтарытэт афіц. тэалогіі, садзейнічала развіццю свецкіх ведаў.

Літ.: Смирин М.М. Народная реформация Томаса Мюнцера и Великая Крестьянская война. 2 изд. М., 1955; Чистозвонов А.Н. Реформационное движение и классовая борьба в Нидерландах в первой половине XVI в. М., 1964; Подокшин С.А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы: (Вторая половина XVI — начало XVII в.). Мн., 1970; Дмитриев М.В. Православие и реформация: Реформационные движения в восточнославянских землях Речи Посполитой во второй половине XVI в. М., 1990; Kosman M. Reformacja i kontrreformacja w Wielkim Księstwie Litewskim w świetle propagandy wyznaniowej. Wrocław etc., 1973. *Г.У.Грушавы, В.Ф.Шалькевіч.*

РЭФАРМІ́ЗМ, ідэйна-палітычная плынь у міжнар. рабочым руху, прадстаўнікі якой лічаць сац. рэформы і супрацоўніцтва паміж класамі і сац. групамі з супярэчлівымі, у т.л. антаганістычнымі інтарэсамі гал. шляхам да паляпшэння капіталіст. грамадства і яго пераўтварэння ў «сац. дэмакратыю», «грамадства дабрабыту» і г.д. Другі бок Р. — адмова ад радыкальнай рэвалюцыі і завяванне рабочым класам дзярж. улады, звужванне ролі класавай барацьбы, якая прызнаецца толькі ў канстытуцыйных межах і фактычна падмяняецца ідэяй сац. партнёрства. Сац. рэформа абвяшчаецца альтэрнатывай рэвалюцыі і карэнным зменам у грамадстве ў сац. кірунку. Гісторыя Р. пачалася ў апошнія дзесяцігоддзі 19 ст., калі частка лідэраў рабочага руху пад уплывам яго поспехаў прыйшла да высновы аб магчымасці паступовага рэфармісцкага паляпшэння тагачаснага грамадства (Э.*Бернштэйн*, К.*Каўцкі*, А.*Мільеран* і інш.). Рабочы рух размежаваўся на рэфармісцкі (с.-д. партыі) і радыкальны (камуніст. партыі) кірункі. У працэсе сваёй эвалюцыі зах.-еўрап. *сацыял-дэмакратыя* імкнулася пазбавіць *марксізм* яго рэв. зместу.

Франкфурцкі кангрэс *Сацыялістычнага Інтэрнацыянала* (1951) абвясціў афіц. дактрынай Р. дэмакр. сацыялізм, які супрацьпастаўляецца марксісцка-ленінскаму разуменню сутнасці сацыяліст. грамадства і спосабаў яго пабудовы. У ідэалогіі Р. *сацыялізм* — перш за ўсё этычны ідэал, які выяўляецца ў прынцыпах свабоды, роўнасці, справядлівасці, чалавечнасці. У эканоміцы дапускаюцца грамадская ўласнасць і планаванне пры панаванні прыватнай уласнасці і капіталіст. канкурэнцыі. Рэфармісцкія ўрады, партыі і прафсаюзы, асабліва ў краінах Зах. Еўропы ў 1960—70-я г., праводзілі палітыку па стварэнні разгорнутай сістэмы сац. забеспячэння працоўных і завяявалі значны ўплыў у грамадстве. У апошнія гады практычнае ажыццяўленне ідэй Р. сустракаецца са значнымі цяжкасцямі, прычыны якіх — глабальная капіталіст. інтэграцыя, узнікненне суперманаполій, абвастрэнне экалагічных праблем. Усё гэта не толькі звужае магчымасці сац. манеўравання і новых рэформ, але вядзе да згортвання ўжо існуючых сац. праграм і мер, напр. у галіне асветы, медыцыны, пенсіённага забеспячэння і інш.

Літ.: Попов С.И. Буржуазная идеология на пороге XXI столетия. М., 1988. *В.І.Боўш.*

РЭФЕРА́Т (ням. Referat ад лац. referre дакладваць, паведамляць), 1) кароткае пісьмовае ці ў форме публічнага выступлення паведамленне пра навук. працу, вынікі вывучэння навук. праблемы, змест кнігі. 2) Даклад на якую-н. тэму, засн. на крытычным аглядзе літ. і інш. крыніц; найб. распаўсюджаная форма выкладу навук. інфармацыі ў навук.-даследчых і адукац. установах. Р. (аўтарэферат) навукоўца змяшчае асн. навук.-тэарэт. палажэнні дысертацыйнай работы. Р. навучэнцаў агульнаадук. школ і сярэдніх спец. навуч. устаноў — паведамленне-агляд па пэўнай тэме на факультатыўных занятках, школьных навук. канферэнцыях і інш.

РЭФЕРЭ́НДАР (ад лац. referendarius службовая асоба), пасада (урад) у Рэчы Паспалітай. У Польшчы пасады свецкага і духоўнага Р. уведзены ў 1507, у ВКЛ вядомы адпаведна з 1539 і 1575. Выслухоўвалі скаргі прыватных асоб і паведамлялі іх змест канцлеру (а той даводзіў іх да караля), паведамлялі рашэнні манарха на пададзеныя просьбы і скаргі. Знаходзіліся стала пры каралю, давалі яму парады. У 1633 духоўны Р. ВКЛ атрымаў права ўдзельнічаць у пасяджэннях Сената з правам дарадчага голасу. У 1635 ураўнаваны ў правах з каронным духоўным Р., засядаў у каралеўскім рэляцыйным судзе, дзе разглядаліся інфлянцкія і курляндскія справы. У гэты час у ВКЛ заснаваны рэферэндарскі суд (ажыццяўляўся аднаасобна духоўным Р.) як вышэйшы дамініяльны суд караля. Разглядаў скаргі сялян каралеўскіх уладанняў (каралеўшчын) ВКЛ на старостаў і дзяржаўцаў. Вышэйшай апеляцыйнай інстанцыяй для рэферэндарскага суда быў задворны асэсарскі (каралеўскі) суд. У 1540—70-я г. пасада Р. існавала і ў Падляшскім ваяв.

РЭФЕРЭ́НДУМ (ад лац. referendum тое, што павінна быць паведамлена), галасаванне выбаршчыкаў па якім-н. пытанні дзярж. або грамадскага жыцця; інстытут непасрэднай дэмакратыі. У адрозненне ад *выбараў* пры Р. аб'ектам з'яўляецца не кандыдат ці спіс кандыдатаў на пэўную пасаду, а пэўнае пытанне — закон, законапраект, канстытуцыя, папраўка да канстытуцыі, якая-н. унутрыпаліт. праблема ці праблема, што адносіцца да міжнар. статуса адпаведнай краіны. Своеасаблівай формай Р. з'яўляецца *плебісцыт* — апытанне насельніцтва пра паліт. лёс тэрыторыі, на якой яно пражывае. Прававую аснову Р. на Беларусі складаюць *Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь* і Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 11.2.2000, якім рэгламентаваны парадак правядзення і падвядзення вынікаў Р. Рэферэндумы могуць быць рэспубліканскія і мясцовыя. На рэсп. Р. выносяцца найважнейшыя пытанні дзярж. і грамадскага жыцця краіны, на мясцовыя — пытанні, што маюць важнейшае значэнне для насельніцтва адпаведных адм.-тэр. адзінак і аднесены да кампетэнцыі іх кіруючых, выканаўчых і распарадчых органаў. Права ініцыятывы на правядзенне рэсп. Р. належыць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Палаце прадстаўнікоў і Савету рэспублікі, грамадзянам краіны (апошняя выносіцца ў выглядзе прапановы не менш чым 450 тыс. грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам, у т.л. не менш як па 30 тыс. грамадзян ад кожнай з абласцей і горада Мінска). Рашэнні, прынятыя Р., могуць быць адменены ці зменены толькі шляхам новага Р. Рашэнне, прынятае Р., падпісвае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь і набывае сілу праз 10 дзён пасля афіц. публікавання, калі ў ім не ўстаноўлены іншы тэрмін. Мясц. Р. назначаюцца мясц. прадстаўнічымі органамі па сваёй ініцыятыве або па прапанове не менш як 10% грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам і пражываюць на адпаведнай тэрыторыі. Рашэнні мясц. Р. падпісваюць кіраўнікі адпаведных мясц. прадстаўнічых органаў. Першы ў гісторыі краіны рэсп. Р. адбыўся 14.5.1995 па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі па пытаннях устанаўлення новай дзярж. сімволікі, змянення статуса рус. мовы, эканам. інтэграцыі з Расіяй, унясення змен у Канстытуцыю, якія прадугледжвалі права датэрміновага прыпынення Прэзідэнтам паўнамоцтваў Вярх. Савета. На рэсп. Р. 24.11.1996 прынята Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 (са змяненнямі і дапаўненнямі). *Г.А.Маслыка.*

РЭФЕРЭ́НТ [ад лац. referens (referentis) які паведамляе], 1) асоба, якая складае або чытае рэферат. 2) Службовая асоба, якая з'яўляецца дакладчыкам або кансультантам па пэўных пытаннях (напр., Р. па сацыялогіі, Р. па эканоміцы).

РЭФЕРЭ́НЦ-ЭЛІПСО́ІД (ад лац. referens які паведамляе, дапаможны), змяны *эліпсоід* з пэўнымі памерамі і становішчам у целе Зямлі. Служыць дапаможнай матэм. паверхняй, да якой зводзяць вынікі ўсіх геад. вымярэнняў на зямной паверхні і тым самым праектуюцца пункты апорнай *геадэзічнай сеткі*. У геад. і картаграфічных работах розных краін карыстаюцца рознымі Р.-э. Гл. таксама *Красоўскага эліпсоід*.

РЭФЛЕ́КС (ад лац. reflexus павернуты назад, адлюстраваны) у жывапісе і графіцы, водсвет, адлюстраванае святло і колер на якой-н. паверхні ад крыніцы святла, у т.л. неба, або суседніх прадметаў, што выклікае змены тону і колеру. Р. — з'ява ў прыродзе і здаўна вядомая мастакам (апісана Леанарда да Вінчы). Разнастайнасць Р. выявілася ў жывапісе ў 19 ст. з пачаткам работы мастакоў на адкрытым паветры і набыла сістэматычны характар у імпрэсіяністаў і творах мастакоў, якія працавалі на *пленэры*.

РЭФЛЕКСАЛО́ГІЯ (ад лац. reflexus адлюстраваны + ...*логія*), кірунак у псіхалогіі, які разглядаў псіхічную дзейнасць у сувязі з нервовымі працэсамі. Вытокі Р. ў прыродазнаўчанавук. тэорыі псіхічнай рэгуляцыі паводзін І.М.*Сечанава*, які сцвярджаў, што ўсе акты свядомых і бессвядомых псіхічных працэсаў рэфлекторныя і павінны даследавацца ў кантэксце фізіялогіі вышэйшай нервовай дзейнасці. Заснавальнік Р. У.М.*Бехцераў* лічыў асн. праблемай псіхалогіі паводзіны, якія разумеў як сукупнасць прыроджаных і набытых *рэфлексаў*, разглядаў Р. як асаблівую навуку, здольную замяніць *псіхалогію*. Р. атрымала развіццё ў 1900—30-я г. ў Расіі і СССР як апазіцыйны кірунак інтраспектыўнай псіхалогіі, адзіным метадам якой было назіранне. Р. выкарыстоўвала выключна аб'ектыўныя метады ў да-

следаванні рэфлексаў, якія працякаюць з удзелам галаўнога мозга. Р. паўплывала на педагогіку, псіхіятрыю, сацыялогію і мастацтвазнаўства. Нягледзячы на шэраг эмпірычных дасягненняў, Р. не змагла пераадолець механістычную трактоўку псіхікі, і ў 1930-я г. большасць рэфлексолагаў перагледзела ранейшыя пазіцыі.

РЭФЛЕ́КСІЯ (ад позналац. reflexio абарачэнне назад, адлюстраванне), прынцып мыслення, накіраваны на асэнсаванне суб'ектам уласнага духоўнага свету; прадметны перагляд ведаў, крытычны аналіз іх зместу і метадаў пазнання. Адрозніваюць і н д ы в і д у а л ь н у ю Р., накіраваную на спасціжэнне чалавекам уласных ведаў, учынкаў, іх межаў і значэння; н а в у к о в у ю Р., вынікам якой з'яўляецца асэнсаванне і крытычны аналіз тэарэт. ведаў, атрыманых пры дапамозе метадаў і прынцыпаў, уласцівых пэўнай галіне навукі; ф і л а с о ф с к у ю Р., накіраваную на пазнанне межаў мыслення і чалавечай культуры наогул.

Праблема Р. паўстала яшчэ ў стараж.-грэч. філасофіі. Сакрат акцэнтаваў ролю Р. ў пазнавальнай дзейнасці. Платон і Арыстоцель лічылі Р. неад'емным атрыбутам божага розуму. У сярэдневяковай філасофіі Р. разглядалася як самавыяўленне «разумовай энергіі» Бога. Як асн. метадалагічны прынцып філасофіі Р. ўсталявалася з 17 ст. Р.Дэкарт трактаваў Р. як спосаб спасціжэння сапраўдных асновапалажэнняў свядомасці. Дж.Лок лічыў Р. крыніцай пазнання, якая мае пачуццёвы, эмпірычны характар. У процілегласць Локу Г.Лейбніц бачыў у Р. крыніцу вышэйшай формы ведаў і характарызаваў яе як выключна інтэлектуальны працэс. І.Кант у сваёй трактоўцы Р. аб'яднаў погляды Лока і Лейбніца: лічыў, што Р. складаецца з пачуццёвага і разумовага сузірання. Г.В.Ф.Гегель разглядаў Р. як унутр. форму развіцця гіст. самасвядомасці і самаразвіцця культуры. З канца 19 ст. ў вырашэнні праблемы Р. існуюць супрацьлеглыя погляды: абсалютызацыя ролі Р. як спосабу аналізу свядомасці (*феаменалогія, неакантыянства*) і крытыка Р. як неадэкватнай крыніцы самапазнання чалавека (Ф.Ніцшэ, В.Дзільтэй, М.Хайдэгер, Ж.Дэрыда). *Н.Г.Кісялёва.*

РЭФЛЕ́КСЫ (ад лац. reflexus адлюстраваны), рэакцыі арганізма, якія выконваюцца нерв. сістэмай у адказ на ўздзеянне знешніх або ўнутр. раздражняльнікаў. Біял. значэнне Р. — падтрымка функцыян. цэласнасці жывога арганізма і пастаянства яго ўнутр. асяроддзя (*гамеастаз*), а таксама забеспячэнне эфектыўнага ўзаемадзеяння арганізма з вонкавым асяроддзем (адаптыўныя паводзіны). Структурны механізм Р. — *рэфлекторная дуга*, эвалюц. папярэднікі — рэакцыі тыпу трапізмаў і *таксісаў*. Утварэнне асобных нерв. клетак, што ўзаемадзейнічалі адна з адной шляхам сінаптычных кантактаў, спрыяла ўзнікненню Р., далейшае развіццё якіх у форме *інстынктаў, безумоўных рэфлексаў* і *ўмоўных рэфлексаў* звязана з паяўленнем і ўскладненнем ц.н.с. У нармальных умовах Р. аб'ядноўваюцца (інтэгруюцца) у складаныя рэфлекторныя акты і маюць пэўную біял. накіраванасць. Інтэграцыя дасягаецца механізмамі каардынацыі — адначасовай дынамікі ўзбуджэння і тармажэння нейронаў адпаведных нерв. утварэнняў. Ускладненне інтэгратыўнай дзейнасці ц.н.с. і яе структурнай дыферэнцыяцыі — аснова эвалюцыі адаптыўных паводзін і прыстасаванасці відаў да ўмоў існавання. *С.С.Ермакова.*

РЭФЛЕ́КТАР (ад лац. reflecto адбіваю), 1) у т э х н і ц ы — адбівальнік, прылада для змены кірунку эл.-магн., светлавых ці гукавых хваль. Складаецца з аднаго або некалькіх люстраў, якія забяспечваюць амаль поўнае адбіццё хваль, што падаюць на іх (шурпатасці адбівальнай паверхні меншыя за даўжыню хвалі). Для канцэнтрацыі адбітых хваль паверхня люстраў увагнутая (сферычная, парабалічная і г.д.). Выкарыстоўваецца ў акустыцы, астраноміі, радыётэхніцы (антэны), быце. 2) У а с т р а н о м і і — тэлескоп з люстраным аб'ектывам. Відарысы свяціл (зорак, планет, Сонца і інш.), якія ствараюцца гал. увагнутым люстрам і сістэмай дапаможных люстраў (выпуклых ці плоскіх), разглядаюць у акуляр, фатаграфуюць ці рэгіструюць інш. святлопрыёмнікамі. Адрозніваюць некалькі тыпаў Р. У параўнанні з *рэфрактарам* у Р. адсутнічае храматычная і меншыя астаткавыя аберацыі (гл. *Аберацыі аптычных сістэм*). Самы вялікі ў свеце Р. знаходзіцца ў Спец. астр. абсерваторыі Рас. АН на Паўн. Каўказе (дыяметр гал. люстра 6 м).

Літ.: М а к с у т о в Д.Д. Астрономическая оптика. 2 изд. Л., 1979. *Я.У.Чайкоўскі.*



Аптычныя схемы **рэфлектараў**: 1— з галоўным фокусам; 2— сістэмы Ньютана; 3— сістэмы Касегрэна; 4— сістэмы Грэгары; 5— сістэмы Мерсена; 6— сістэмы Несміта.

РЭФЛЕКТО́НАЯ ДУГА́, сукупнасць утварэнняў, якія ажыццяўляюць рэакцыю арганізма (*рэфлекс*) на раздражненне *рэцэптараў*. У састаў Р.д. ўваходзяць нерв. канцы, што ўспрымаюць раздражненне (рэцэптары); адчувальныя (аферэнтныя) нерв. валокны (перадаюць імпульсы ад рэцэптараў у ц.н.с.); *нервовы цэнтр* (успрымае ўзбуджэнне і перадае яго ўставачным і эфектарным нейронам); рухальныя (эферэнтныя) нерв. валокны (праводзяць узбуджэнне ад нерв. цэнтра да выканаўчых апаратаў); эфектары, выканаўчыя органы (мускулатура, залозы і інш.), якія мяняюць сваю дзейнасць у выніку рэфлексу. У Р.д. нерв. імпульс праводзіцца ў адным напрамку ад аферэнтнага нейрона да эферэнтнага, што вызначаецца механізмам сінаптычнай міжнейроннай перадачы. *А.С.Леанцюк.*

РЭФО́РМА (франц. réforme ад лац. reformare пераўтвараць), пераўтварэнне, змяненне, перабудова якога-н. боку грамадскага жыцця (парадкаў, ін-таў, устаноў); фармальна — новаўвядзенне любога зместу, аднак часцей Р. называюць прагрэсіўнае пераўтварэнне пры захаванні асноў існуючага сац. ладу. Сац.-паліт. Р. садзейнічае эвалюцыйнаму развіццю грамадства і характарызуецца параўнальнай паступовасцю, плаўнасцю сац. і паліт. змен. Паліт. Р. могуць ахопліваць паліт. сістэму грамадства ў цэлым або абмяжоўвацца якімі-н. яе сферамі, рэарганізоўваць вышэйшыя эшалоны ўлады ці органы мясц. кіравання, вырашаць праблемы раздзялення і раўнавагі ўлад, іх субардынацыі. Р. ў пэўнай меры рэгламентуюць функцыі розных галін улады, уплываюць на этыка-прававыя нормы і стыль дзейнасці як кіраўніка дзяржавы, так і ўладных структур, на становішча правоў і свабод чалавека, на сац.-псіхал. і паліт. клімат у краіне. Р. праводзяцца ў розных сферах грамадскага жыцця: зямельныя, судовыя, грашовыя, школьныя, пенсіённыя, ваенныя, царкоўныя і інш. (гл. таксама *Рэформа дзяржаўных маёмасцей, Рэформы азбукі і правапісу, Рэформы моўныя*). Гіст. вопыт паказвае, што поспех або няўдача Р. у значнай меры залежаць ад своечасовасці іх правядзення, гатоўнасці ўладных структур пайсці на такія новаўвядзенні, якія могуць сапраўды зняць напружанасць у грамадстве; няўдала праведзеныя Р. могуць прывесці да рэв. працэсаў, негатыўных з'яў у розных сферах жыццядзейнасці людзей. *В.Дз.Марозаў.*

РЭФО́РМА ДЗЯРЖА́ЎНАЙ ВЁСКІ 1830—50-х ГАДО́Ў, сістэма мер у Рас. імперыі, накіраваных на ўздым пры-

бытковасці дзярж. маёнткаў, прыпыненне працэсу абеззямельвання і збяднення *дзяржаўных сялян*, змяншэння сац. напружання ў вёсцы. Аўтар і распрацоўшчык рэформы граф П.Дз.*Кісялёў*. Рэформа праводзілася па 3 асн. кірунках: перабудова кіравання, арганізацыя «апякунства» і *люстрацыя* 1840—50-х г. У выніку перабудовы кіравання дзяржаўнай вёскай агульнакіраўнічыя функцыі, раней сканцэнтраваныя ў дэпартаменце дзярж. маёмасцей мін-ва фінансаў, з 1.1.1838 перадаваліся новаму мін-ву дзярж. маёмасцей (міністр Кісялёў). Ніжэйшыя ступені кіравання фарміраваліся паводле «Устанаўлення аб кіраванні дзяржаўнымі маёмасцямі ў губернях» і «Палажэння аб люстрацыі дзяржаўных маёмасцей заходніх губерняў і Беластоцкай вобласці» ад 28.12.1839, якое ўлічвала мясц. асаблівасці. На Беларусі ўстанаўліваліся 3 адм. ярусы кіравання дзярж. вёскай: губерня — акруга — сельскае ўпраўленне. Функцыі валасной адміністрацыі ў бел. губернях былі размеркаваны паміж часовымі ўладальнікамі і сял. выбарнымі. Новы адм. апарат пачаў дзейнічаць з крас. 1840. У кампетэнцыю губ. органаў — палат дзярж. маёмасцей уваходзілі выбар форм кіравання дзярж. маёнткамі, правядзенне рэвізій, люстрацый, ахова грамадскага парадку, пытанні харч. і мед. дапамогі і інш. Акруговая адміністрацыя займалася непасрэднай арганізацыяй сельскіх грамад. Органы сельскіх упраўленняў (сельскія сход, управа, староста) займаліся землеўладкаваннем, раскладкай падаткаў і збораў паміж сялянамі і інш. *Абшчына*, адроджаная ў дзярж. маёнтках Беларусі пасля далучэння да Расіі, у выніку рэформы была максімальна набліжана да агульнарас. ўзору. На Беларусі ўзнікла арэнда сялянамі зямельных угоддзяў. Палітыка «апякунства» над дзяржаўнымі сялянамі заключалася ў арганізацыі харч. дапамогі сялянам праз спец. хлебазапасныя магазіны. Для арганізацыі пачатковага навучання дзяцей дзярж. сялян у сельскіх грамадах адчыняліся прыходскія школы. Дзярж. маёнткі забяспечваліся фельчарамі, павітухамі, сялянам пачалі рабіць прышчэпкі. Люстрацыя 1840—50-х г. — асн. частка рэформы — мела на мэце правядзенне дакладнага ўліку сял. даходаў, раўнамернае надзяленне дзярж. сялян зямлёй, рэгламентацыю павіннасцей (перавод з паншчыны на грашовы аброк і інш.). Гал. вынік рэформы — адмова ад прыгоннай сістэмы і пераход на аброк. Адбыліся перамены і ў прававым становішчы дзярж. сялян (прызнаваліся грамадз. свабоды, што адрознівала іх ад памешчыцкіх падданых).

Літ.: Конюхова Т.А. Государственная деревня Литвы и реформа П.Д.Киселева, 1840—1857 гг. М., 1975. *В.Э.Загарульская.*

РЭФО́РМЫ МО́ЎНЫЯ, змены ў графіцы, правапісе і марфалогіі, якія абумоўлены развіццём мовы ў яе вусным і пісьмовым варыянтах, адлюстроўваюць пэўныя сацыяльныя запатрабаванні, неабходнасць якіх вызначаецца спецыялістамі-мовазнаўцамі і потым узаконьваюцца органамі ўлады. Фарміраванне бел. азбукі, норм і правіл правапісу і марфалогіі звязана са станаўленнем *літаратурнай мовы*. Выпрацоўка грамат. асаблівасцей і моўна-выяўленчых сродкаў новай бел. літ. мовы ў 19 ст. адбывалася ў неспрыяльных грамадска-паліт. умовах. Разам з развіццём лексікі, грамат. ладу ішла і стыхійная выпрацоўка норм і правіл пісьма; спец. Р.м. не праводзіліся. Літ.-маст., публіцыстычныя і фальклорныя творы запісваліся на роднай гаворцы аўтара. У кнігадрукаванні на бел. мове на працягу ўсяго 19 ст. выкарыстоўваліся 2 графічныя сістэмы — *грамадзянскі шрыфт* і лацінка (гл. *Лацінскае пісьмо*), што стрымлівала выпрацоўку і замацаванне правапісных норм. Дзвюма графічнымі сістэмамі друкаваліся і першыя бел. легальныя газеты «*Наша доля*» і «*Наша ніва*», прычым экзэмпляры з грамадз. шрыфтам распаўсюджваліся пераважна сярод правасл. беларусаў, а на лацініцы — сярод каталіцкага бел. насельніцтва. Аднак значныя матэрыяльныя затраты прымусілі рэдакцыю «Нашай нівы» звярнуцца да чытачоў з прапановай выказаць меркаванне пра тое, якім шрыфтам друкаваць газету ў далейшым. Разнастайныя меркаванні па гэтым пытанні змяшчаліся ў газеце ў 1912, большасць падпісчыкаў выказалася за грамадзянскі шрыфт, які і быў прыняты з канца 1912. Праведзеная рэдакцыяй дыскусія была па сутнасці першым у гісторыі бел. мовазнаўства мерапрыемствам, у якім прынялі ўдзел шырокія колы грамадскасці. Аднак выкарыстанне лацінкі ў некат. выданнях працягвалася і пазней, а ў Зах. Беларусі ёю карысталіся да 1939. У 1917—18 пачалі з'яўляцца спец. даведнікі па бел. *арфаграфіі* (А.Луцкевіча, Я.Лёсіка, Б.Пачопкі, Р.Абіхта і Я.Станкевіча), у якіх нярэдка выказваліся супярэчлівыя погляды. Найб. значнай мовазнаўчай працай таго часу была «Беларуская граматыка для школ» Б.Тарашкевіча, выдадзеная ў Вільні ў 1918. Правапіс Тарашкевіча ўзаконіў асн. арфаграфічныя прыёмы, выпрацаваныя ў бел. друку перыяду «Нашай нівы»: галосныя перадаюцца па фанетычным прынцыпе, зычныя — па марфалагічным. У Сав. Беларусі правапіс Тарашкевіча папулярызаваў Лёсік у сваіх падручніках. Аднак у сувязі з *беларусізацыяй* і павелічэннем колькасці людзей, якія карысталіся бел. пісьмовай мовай, з сярэдзіны 1920-х г. выявіліся недахопы правапісу Тарашкевіча. Таму Навук. рада Інбелкульта прыняла рашэнне правесці навук. канферэнцыю па рэформе бел. правапісу. Канферэнцыі папярэднічала выданне 9 брашур па спрэчных пытаннях правапісу, у якіх шырокія колы грамадскасці мелі магчымасць пазнаёміцца з тагачаснымі правапіснымі праблемамі і шляхамі іх вырашэння. Канферэнцыя адбылася ў Мінску 14—21.11.1926. На сваіх маштабах і праграме яна выйшла далёка за межы тагачасных навук. канферэнцый і за ёю замацавалася назва акадэмічнай. У ёй прынялі ўдзел 69 прадстаўнікоў бел. навукі і культуры, дэлегаты з мовазнаўчых устаноў Масквы, Ленінграда, Кіева і 10 замежных мовазнаўцаў і дзеячаў культуры. Работа канферэнцыі вялася ў 3 камісіях: графічнай, правапіснай і літаратурнай. У правапісную камісію ўваходзіла 30 удзельнікаў канферэнцыі. Па спрэчных пытаннях правапісу выказваліся самыя разнастайныя прапановы і рэкамендацыі, якія, аднак, не лічыліся абавязковымі, паколькі іх рэалізацыю трэба было ўзаконіць. На канферэнцыі прынята рашэнне працягваць работу ў правапіснай камісіі Інбелкульта, якая на працягу 1927—29 падрыхтавала праект новага правапісу, апублікаваны ў 1930 для шырокага абмеркавання. На аснове гэтага праекта СНК БССР 26.8.1933 зацвердзіў пастанову «Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу». У адпаведнасці з пастановай у бел. правапіс унесены наступныя змены: чаргаванне гукаў «о»—«а» (*аканне*) пашыралася на ўсю лексіку («прафесар», «сакратар»), за выключэннем некат. т.зв. інтэрнац. слоў тыпу «совет», «большэвік»; рэкамендавалася не перадаваць на пісьме асіміляцыйнай мяккасці зычных («снег», «ляснік» замест «сьнег», «лясьнік»); скасоўвалася перадача мяккага «л» у запазычанай лексіцы («план», «клас» замест «плян», «кляс»); уводзілася правіла, у адпаведнасці з якім перад галоснымі пярэдняга рада зычныя вымаўляюцца мякка («сістэма», «метад» замест «сыстэма», «мэтад»); чаргаванне гукаў «э»—«а» (*яканне*) абмяжоўвалася толькі 1-м пераднаціскным складам («землі—зямля», «несці—нясу»); прыназоўнік «без» і адмоўе «не» прапанавана пісаць з літарай «е» («без цябе», «не было»). У галіне марфалогіі праводзілася пашырэнне канчатка «-а» ў родным склоне назоўнікаў мужчынскага роду («завода», «цэха», «правапіса»), адмяняліся паралельныя формы на «-ом», «-ох» у назоўніках мужчынскага і ніякага роду ў давальным і месным склонах мн.л. («братам», «аб братах», «гарадам», «аб гарадах»), выключаліся паралельныя формы дзеясловаў на «-яце», «-іце» 1-га спражэння цяперашняга часу 2-й асобы мн.л. («працуеце», «ідзеце», «нясеце»), уводзіліся дзеепрыметнікі незалежнага стану, асабліва калі яны азначаюць сац. сэнс («пануючы клас» замест «класа, якая пануе»). На аснове пастановы 1933 АН Беларусі ў 1934 выдадзены звод важнейшых арфаграфічных і грамат. правіл «Правапіс беларускай мовы», на якім грунтаваліся падручнікі і дапаможнікі на працягу наступных дзесяцігоддзяў.

У пасляваенны час Арфаграфічная камісія на чале з Я.Коласам, К.Крапівой і П.Глебкам падрыхтавала чарговы

праект змен і ўдакладненняў бел. правапісу. У 1950 і 1952 гэты праект абмяркоўваўся ў АН Беларусі і быў зацверджаны 11.5.1957 пастановай СМ БССР «Аб удакладненні і частковых зменах існуючага беларускага правапісу». У новым праекце ўдакладняўся правапіс ненаціскных «о» і «е», правапіс «д», «т» і «дз», «ц», раздзяляльных апострафа і мяккага знака, падоўжаных зычных, складаных слоў, а таксама канчаткаў некат. назоўнікаў, дзеясловаў і лічэбнікаў. На аснове гэтай пастановы складзены і выдадзены «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (1959), якія фармальна захоўваюць сваю сілу і ў наш час. Новы этап рэфармавання бел. літ. мовы пачаўся ў 2-й пал. 1980-х г. У 1993 была створана Дзярж. камісія па ўдакладненні правапісу бел. літ. мовы, якую ўзначаліў Н.Гілевіч. У 1994 камісія рэкамендавала Нац. АН Беларусі і Мін-ву адукацыі падрыхтаваць новую рэдакцыю «Правіл беларускай арфаграфіі і пунтуацыі». У 1999 часовым навук. калектывам з членаў ранейшай Дзярж. камісіі выдадзены «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі: (Праект новай рэдакцыі)».

Літ.: Камароўскі Я.М. Беларускі правапіс. Мн., 1965.

А.І.Жураўскі, Я.М.Камароўскі.

РЭФРАКТАМЕ́ТРЫЯ (ад лац. refractus пераломлены + *...метрыя*), сукупнасць метадаў даследаванняў фіз. і хім. уласцівасцей рэчываў на аснове вымярэння *пераламлення паказчыка* святла; раздзел прыкладной *оптыкі*. Вымярэнні праводзяцца з дапамогай *рэфрактометраў* і двухпрамянёвых *інтэрферометраў* (для вымярэння паказчыка пераламлення з блізкімі да 1 значэннямі). Метады Р. выкарыстоўваюцца ў хіміі, фармацэўтычнай, харч. і інш. галінах прам-сці для вызначэння саставу і структуры рэчываў, а таксама для кантролю іх якасці; у аэра- і гідрадынамічных даследаваннях і аптычнай прам-сці — для праверкі аднароднасці рэчываў і інш.

РЭФРА́КТАР (ад лац. refractus пераломлены), тэлескоп з лінзавым *аб'ектывам*. Упершыню выкарыстаны Г.*Галілеем* для астр. назіранняў (1609). Бывае візуальны (складаецца з аб'ектыва і акуляра) і фатаграфічны (мае аб'ектыў і касету з фотапласцінкай). Спалучэнне ў аб'ектыве 2 і болей лінзаў са шкла з рознай аптычнай шчыльнасцю дае магчымасць выправіць сферычную і храматычную аберацыі аб'ектыва. Адносная адтуліна Р. звычайна 1:15 (гл. *Святласіла*). *Раздзяляльная здольнасць* Р. тым большая, чым большы дыяметр аб'ектыва, што дае магчымасць вывучаць менш яркія нябесныя целы. Самы вялікі ў свеце Р. (ЗША) мае дыяметр аб'ектыва 1,02 м, Р. Пулкаўскай абсерваторыі — 0,65 м. Невялікія Р. устанаўліваюцца на азімутальнай ці экватарыяльнай манціроўках, буйныя — толькі на экватарыяльнай. Р. шырока выкарыстоўваюцца ў невялікіх візуальных (напр., астраметрычных) інструментах.

Літ.: Максутов Д.Д. Астрономическая оптика. 2 изд. Л., 1979.

Я.У.Чайкоўскі.

РЭФРАКТО́МЕТР (ад лац. refractus пераломлены + *...метр*), аптычная прылада для вымярэння паказчыка пераламлення святла ў газах, вадкіх і цвёрдых асяроддзях. Бываюць лабараторныя і прамысловыя, якія наз. таксама рэфрактаметрычнымі датчыкамі.

У лабараторных Р., прынцып дзеяння якіх заснаваны на *пераламленні святла*, даследаванаму ўзору надаюць форму прызмы і па вымераным вугле адхілення прамянёў у ёй вылічваюць *пераламлення паказчык n*. У Р., якія выкарыстоўваюць *поўнае ўнутранае адбіццё*, *n* вызначаецца па значэнні лімітнага вугла выхаду праменя з даследаванага ўзору ў асяроддзе з вядомым *n* (ці ў адваротным напрамку). Прамысловыя Р. прызначаны для неперарыўнай аўтам. рэгістрацыі дынамікі выт. працэсаў; іх выкарыстоўваюць і ў аўтам. лініях для рэгулявання тэхнал. працэсаў.

РЭФРА́КЦЫЯ святла, скрыўленне светлавога праменя ў асяроддзі з плаўна і неперарыўна пераменным *пераламленнем паказчыкам*. У шырокім сэнсе — тое, што *пераламленне святла*. Тэрмінам «Р.» карыстаюцца ў атм. і акулярнай оптыцы, а таксама ў оптыцы вока. У выніку Р. пры пэўных умовах узнікаюць *міражы* і інш. аптычныя з'явы (напр., *вясёлка*, *гало*).

РЭФРЫЖЭРА́ТАР (франц. réfrigérateur ад лац. refrigerare ахалоджваць), транспартны сродак з цеплаізаляванымі камерамі і *халадзільнымі ўстаноўкамі* для перавозкі хуткапсавальных грузаў. У якасці Р. выкарыстоўваюць спец. ізатэрмічныя аўтамабілі і прычэпы, *вагоны* і паязды, судны. Ізатэрмічныя аўтамабілі маюць кузаў з цеплаізаляцыяй, якая абмяжоўвае цеплаабмен паміж унутр. і вонкавымі паверхнямі. Адрозніваюць аўтамабілі-лядоўнікі, аўтамабілі-Р. (з аўтам. халадзільнымі ўстаноўкамі) і з эл. ацяпленнем (забяспечвае т-ру ад +10 да -15 °С). Рэфрыжэратарныя судны бываюць грузавыя (сухагрузы) або грузапасажырскія; пашыраны рэфрыжэратарныя *рыбапрамысловыя судны*.

Аптычныя схемы **рэфрактараў**: а — візуальнага; б — фатаграфічнага; 1 — аб'ектыў; 2 — акуляр; 3 — шторка; 4 — фотапласцінка; 5 — касета.

РЭФРЭ́Н (ад франц. refrain прыпеў), 1) у музыцы тэма інстр. або вак. муз. твора, якая праходзіць у ім не менш як 3 разы і замацоўвае яго кампазіцыйна. Характэрны для *ронда* і блізкіх да яго муз. форм. Часам Р. становіцца лейттэмай (гл. *Лейтматыў*), правядзенне якой звязана з увасабленнем найб. важных ідэй.

Тэрмін «Р.» уведзены ў 12—16 ст. для абазначэння паўтарэнняў заканчэння страфы ў песенных формах; у музыказнаўстве часцей карыстаюцца тэрмінам «прыпеў».

2) У вершаскладанні слова, радок або страфа, якія паўтараюцца праз пэўную колькасць радкоў у вершы. Р. нясе вял. сэнсавую нагрузку, звычайна ў ім увасоблена гал. ідэя твора. Так, у «Песні вольнага чалавека» Я.Купалы кожнаму катрэну спадарожнічае наступны Р.:

Душой я вольны чалавек,
І гэткім буду цэлы век!

В.П.Рагойша (у вершаскладанні).

РЭ́ХА, акустычная ці эл.-магн. хваля, што адбіваецца ад якой-н. перашкоды і рэгіструецца прыёмнікам ці назіральнікам. Гукавое Р. (пошчак) распазнаецца на слых, калі інтэрвал паміж пасланым і прынятым сігналамі 50—60 мс і больш. Для некаторых жывёл (напр., кажаны, дэльфіны, кіты) Р. — сродак арыенціроўкі і пошуку здабычы. Эл.-магн. Р. выкарыстоўваецца, напр., у радыёлакацыі, далёкай радыёсувязі на кароткіх хвалях; акустычнае — у гідралакацыі, ультрагукавой дэфектаскапіі.

«РЭ́ХА НА ПАЛЕ́ССІ», гл. *Пліцкая аперацыя 1942*.

РЭХАВЕ́РШ, верш, у якім сумежныя радкі зарыфмаваны рэхарыфмай. Няцотныя радкі ў ім звычайна доўгія, а цотныя — кароткія, з адна- ці двухскладовых слоў. Прыклад — жартоўны Р. «Цімох» А.Русака:

Як правёў мяне Цімох,
Ох, ох!
Было цёмна на дварох,
Ох, ох!
«Ну, Цімошка, дык бывай»,
Ай, ай!
А ён кажа: «Пачакай»,
Ай, ай!

В.П.Рагойша.

РЭХАЛО́Т (ад *рэха* + *лот*), гідраакустычная прылада для вымярэння глыбіні вадаёма ці глыбіні апускання ў ваду якіх-н. цел. Дзеянне Р. заснавана на вымярэнні часу праходжання *ультрагуку* ад днішча судна, дзе знаходзяцца выпрамяняльнік і прыёмнік сігналаў, да дна (цела) і назад. Выкарыстоўваюць у суднаходстве, рыбалоўстве і інш. Таксама Р. — прылада для вымярэння глыбіні ўзроўню ў буравой свідравіне, па якім вызначаецца ціск на забой слупа вадкасці. Засн. на вымярэнні часу праходжання гуку ад вусця свідравіны да ўзроўню вадкасці і назад.

РЭЦІНО́Л, вітамін А, растваральны ў тлушчах вітамін, $C_{20}H_{30}O$. У арганізме жывёл і чалавека ўтвараецца з ка-

раціну, які паступае з ежай. Назапашваецца гал. чынам у печані (асабліва ў печані марскіх жывёл, рыб).

Недахоп Р. (або правітамінаў А) у ежы вядзе да хвароб вачэй, затрымкі росту маладых арганізмаў; лішак — да парушэнняў абмену рэчываў (гл. *Гіпервітамінозы*). Р. удзельнічае ў біяхім. працэсах. Сутачная патрэба ў Р. дарослага чалавека — 0,4—0,7 мг, дзіцяці — 1 мг. Выкарыстоўваецца ў медыцыне.

РЭЦІРА́ДА (ад франц. retirer адступаць), 1) адступальныя баявыя дзеянні войск (адыход) у мэтах заняцця новых пазіцый. 2) Умацаванні ў палявых пазіцыях і крапасных збудаваннях для абароны ў выпадку *адступлення*. Тэрмін «Р.» часам выкарыстоўваўся ў значэнні ўхілення ад рашучых дзеянняў.

РЭЦЫДЫ́Ў (ад лац. recidivus які вяртаецца) у м е д ы ц ы н е, вяртанне хваробы пасля перыяду *рэмісіі*. Узнікае пры няпоўным вылячэнні хваробы, што пры неспрыяльных умовах прыводзіць да аднаўлення яе клінічных праяў. Бывае пры некат. формах артрыту, рэўматызму, язвавай хваробе, пухлінах і інш. Для некат. хвароб узнікненне Р. адлюстравана ў назвах, напр., зваротны тыф, рэцыдывуючы параліч.

РЭЦЫДЫ́Ў ЗЛАЧЫ́НСТВАЎ, учыненне наўмыснага *злачынства* асобай, якая мае судзімасць за наўмыснае злачынства (шматразовасць злачынстваў). У адпаведнасці з бел. крымінальным заканадаўствам Р.з. прызнаецца небяспечным пры ўчыненні асобай наўмыснага злачынства, за якое яна асуджаецца да пазбаўлення волі, калі раней гэта асоба двойчы была асуджана да пазбаўлення волі за наўмысныя злачынствы; пры ўчыненні цяжкага злачынства, калі раней гэта асоба асуджалася таксама за цяжкае злачынства. Р.з. прызнаецца асабліва небяспечным пры ўчыненні асобай наўмыснага злачынства, за якое яна асуджаецца да пазбаўлення волі, калі раней гэта асоба болей як адзін раз асуджалася да пазбаўлення волі за цяжкае злачынства; пры ўчыненні цяжкага злачынства, калі гэта асоба двойчы асуджалася да пазбаўлення волі за цяжкае злачынства або за асабліва цяжкае злачынства; пры учыненні асабліва цяжкага злачынства, калі гэта асоба раней была асуджана да пазбаўлення волі за цяжкае або асабліва цяжкае злачынства. Р.з. цягне больш суровае пакаранне на падставе і ў межах, устаноўленых крымін. кодэксам. *Э.І.Кузьмянкова.*



Схема суднавага **рэхалота**: 1 — дыск са шкалой глыбінь; 2 — электрарухавік; 3 — генератар ультрагукавой частаты; 4 — гідраакустычны выпрамяняльнік; 5 — гідраакустычны прыёмнік; 6 — узмацняльнік сігналаў.

РЭЦЫПІ́ЕНТ [ад лац. recipiens (recipientis) які прымае, атрымлівае], чалавек (у эксперыменце жывёла), якому пераліваюць донарскую кроў, яе прэпараты (гл. *Пераліванне крыві*) або робяць трансплантацыю органа, тканак ад донара. Р. наз. таксама клетку, якая атрымлівае генет. матэрыял (ДНК) ад інш. клеткі (донара).

РЭЦЫПРО́КНАЕ СКРЫЖАВА́ННЕ, сістэма двух скрыжаванняў, якія характарызуюцца ўзаемна процілеглым спалучэннем прыкметы, што аналізуецца, і полу (або тыпу спарвання) у форм, якія прымаюць удзел у скрыжаванні. Напр., калі пры адным скрыжаванні ў жывёл самка мела дамінантную прыкмету, а самец — рэцэсіўную, то ў другім скрыжаванні, рэцыпрокным першаму, самка павінна мець рэцэсіўную прыкмету, а самец — дамінантную. Р.с. выкарыстоўваецца ў генет. аналізе для выяўлення спадчынных фактараў, лакалізаваных у Х-храмасоме (гл. *Палавыя храмасомы*). Таксама ў выпадку *анізагаміі* выяўляюцца цытаплазматычныя спадчынныя фактары, калі ў абодвух Р.с. у спадчыну перадаецца толькі мацярынская прыкмета. *Р.Г.Заяц.*

РЭЦЭ́НЗІЯ (ад лац. recensio разгляд, ацэнка), артыкул-даследаванне адлюстраванай рэчаіснасці, у якім ацэньваецца маст. (літ., муз., кінематаграфічны, тэатр. і інш.), навук. ці навук.-папулярны твор, разглядаюцца вартасці і недахопы яго зместу і формы; аналіт. жанр газетна-часопіснай публіцыстыкі, літ., маст., навук. крытыкі. Галоўнае ў Р. — ацэнка важкасці аўтарскіх канцэпцый і правільнасці меркаванняў, вывадаў, рэкамендацый. Рэцэнзент ацэньвае тэарэт. і практ. значнасць новых ідэй, сац. мадэлей, тэхн. навінак, падмацоўваючы свае вывады сістэмай аргументаў і тэкставых вытрымак. Вылучаюць некалькі асн. відаў Р.: невял. крытычны або публіцыстычны артыкул (часта палемічнага характару), у якім выказаны адносіны да пэўнага твора ці вынаходніцтва; разгорнутая анатацыя, якая раскрывае змест твора; маст.-публіцыстычная інтэрпрэтацыя твора (*эсэ*) з роздумам-ацэнкай; аўтарэцэнзія, у якой аўтар выкладае погляд на свой твор ці палемізуе з крытыкам адносна тлумачэння гэтага твора ў друку. Адметнасць Р. як жанру: своеасаблівыя стыль, прыёмы распрацоўкі і трактоўкі тэмы, спецыфічныя сюжэтныя і кампазіцыйныя сродкі. Р. як асобая форма літ.-маст. крытыкі ўключае логіка-вобразную карціну ўспрымання твора, сістэму ўспрымання і пазнання навакольнай рэчаіснасці, засн. на ўласным вопыце рэцэнзента. Рэцэнзент выкарыстоўвае аўтарскія канцэпцыю выкладу і думку, таму Р. не прэтэндуе на поўную самастойнасць. *Т.У.Люковіч.*

РЭЦЭ́ПТ (ад лац. receptum прынятае, узятае), пісьмовы зварот урача (на друкаваным бланку) у аптэку аб водпуску лек. сродкаў у пэўнай дазіроўцы (або прыгатаванні лек. формы з указаннем спосабу ўжывання).

РЭЦЭ́ПТАРЫ (ад лац. receptor той, хто прымае, атрымлівае), у жывёл і чалавека адчувальныя ўтварэнні, якія ўспрымаюць і ператвараюць раздражненні з вонкавага і ўнутр. асяроддзя ў спецыфічную актыўнасць нерв. сістэмы. Забяспечваюць арганізм неабходнай для яго існавання інфармацыяй і прыстасаваны для ўспрымання істотных для дадзенага віду жывёлы сігналаў.

Адрозніваюць Р. ў выглядзе свабодных канцоў нерв. валокнаў, дыферэнцыраваных нерв. канцоў, размешчаных у глыбіні тканак, і як ч. складаных сенсорных органаў. Большасць Р. — экстэрарэцэптары (органы слыху, зроку, нюху, смаку, дотыку), якія ўспрымаюць раздражненні з вонкавага асяроддзя. *Інтэрарэцэптары* сігналізуюць аб стане ўнутр. органаў (сэрца, лёгкія, лімфатычныя і крывяносныя сасуды і інш.) і апорна-рухальнага апарату (*пропрыярэцэптары* шкілетных мышцаў, звязак, сустаўных сумак). Адны Р. атрымліваюць інфармацыю на пэўнай адлегласці ад крыніцы раздражнення (дыстантныя), другія — толькі пры непасрэдным сутыкненні з ёй (контактныя). У залежнасці ад віду ўспрымальнага раздражнення адрозніваюць: *механарэцэптары* (Р. органаў слыху і гравітацыі, тактыльныя, апорна-рухальнага апарату, *барарэцэптары* сардэчна-сасудзістай сістэмы і інш.); *хемарэцэптары* (Р. смаку і нюху, сасудзістыя і тканкавыя, адчувальныя да ўздзеяння хім. злучэнняў); фотарэцэптары (Р. органа зроку); *тэрмарэцэптары* (Р. скуры і ўнутр. органаў, што ўспрымаюць тэмпературныя ваганні, а таксама цэнтр. тэрмаадчувальныя нейроны); электрарэцэптары (электраадчувальныя Р. бакавой лініі). Усе Р. спецыялізаваны для рэцэпцыі адэкватных ім раздражняльнікаў. Іх функцыі ўзаемазвязаны праз ц.н.с. і з дапамогай кантактаў аднаго з адным. Дзейнасць Р. рэгулюецца ц.н.с.

У б і я х і м і і Р. наз. малекулы ці малекулярныя комплексы на паверхні клетак, здольныя распазнаваць спецыфічныя хім. групоўкі, малекулы ці інш. клеткі, звязваць іх і рэагаваць на ўзаемадзеянне канфармацыйнымі зменамі або перадачай сігналаў унутр. клеткі. Да рэцэптарных малекул належаць Р. гармонаў, вірусаў, таксінаў і інш.

Літ.: С е р г е е в П.В., Ш и м а н о в с к и й Н.Л. Рецепторы физиологически активных веществ. М., 1987; Внутриклеточная сигнализация. М., 1988; П а л ь ц е в М.А., И в а н о в А.А. Межклеточные взаимодействия. М., 1995. *А.С.Леанцюк.*

РЭЦЭ́ПЦЫЯ (ад лац. receptio прыняцце), у тэорыі права — запазычанне або

аднаўленне. У гісторыі права тэрмін «Р.» ўжываўся для абазначэння запазычання, успрымання якой-н. унутрыдзяржаўнай прававой сістэмай прынцыпаў, ін-таў, рысаў інш. унутрыдзярж. прававой сістэмы. У такім сэнсе разумелася Р. рымскага права правам шэрагу еўрап. дзяржаў. У тэорыі міжнар. права Р. часам азначае дакладнае аднаўленне ў нац. прававых актах фармулёвак міжнар.-прававых актаў або забеспячэнне дзяржавай з дапамогай нац. заканадаўства выканання сваіх міжнар. абавязацельстваў.

РЭЦЭСІЎНАСЦЬ (ад лац. recessus адступленне, выдаленне), адсутнасць фенатыпічнага праяўлення аднаго *алеля* і абумоўленай ім бацькоўскай прыкметы ў гетэразіготнай асобіны, якая мае 2 розныя алелі аднаго *гена*. Напр., пры скрыжаванні чырванаплодных памідораў з жаўтаплоднымі першае пакаленне звычайна мае чырв. плады (дамінантная прыкмета, гл. *Дамінантнасць*). У наст. пакаленнях магчыма праяўленне ў гомазіготнай асобіны, якая мае 2 аднолькавыя алелі аднаго гена, жоўтай афарбоўкі (рэцэсіўная прыкмета). Насычанасць прыродных папуляцый рэцэсіўнымі генамі мае вял. значэнне для выжывання віду пры змене ўмоў існавання.

Р.Г.Заяц.

РЭЧ у ф і л а с о ф і і, частка матэрыяльнага свету, адносна ўстойлівая і адасобленая ад інш. частак, якая характарызуецца пэўнымі якасцямі, унутр. і знешнімі адносінамі. Да Р. адносіцца шматлікая колькасць разнастайных *прадметаў*, з'яў прыроды і грамадства. Кожная Р. узаемадзейнічае з інш. Р., якасна і колькасна змяняецца, уключаецца ў пэўныя працэсы развіцця матэрыяльных сістэм. У якасці сіноніма Р. часта выкарыстоўваюць паняцце «прадмет», аднак ім вызначаецца і фрагмент матэрыяльнай *рэчаіснасці*, і аб'ект пазнання, у якасці якога можа выступаць абстрактнае паняцце. І.Кант увёў паняцце незалежнай ад свядомасці «Р. ў сабе», якая ўздзейнічае на органы пачуццяў, але не атрымлівае адэкватнага адлюстравання і таму недаступная пазнанню. Навука даказвае пазнавальнасць Р. Паняцце «Р.» цесна звязана з паняццем «*ідэя*». Р. аб'ектыўная і існуе незалежна ад ідэі. Ідэя з'яўляецца адлюстраваннем Р., правільным ці скажоным. Існуе і адваротная залежнасць. Адрозніваюць натуральныя і штучныя Р. (створаныя чалавекам шляхам змянення прыроднага матэрыялу). Штучная Р. з'яўляецца вынікам пераўтварэння ідэальнага ў матэрыяльнае, рэчаіснае. Паняцце «Р.» выкарыстоўваецца таксама ў сац.-эканам. тэорыях для вызначэння «арэчаўлення» адносін паміж людзьмі ва ўмовах развіцця таварнай вытв-сці і рынку.

В.Дз.Марозаў.

РЭЧ у п р а в е, прадмет знешняга (матэрыяльнага) свету, які знаходзіцца ў натуральным стане ў прыродзе або створаны працай чалавека і з'яўляецца асн. аб'ектам у маёмасных *праваадносінах*. У цывільным праве Р. прызнаюцца таксама грошы і каштоўныя паперы. Р. падзяляюцца на вызначаныя родавымі прыкметамі і індывідуальна-вызначаныя, падзельныя і непадзельныя, выкарыстоўваемыя і невыкарыстоўваемыя. Адрозніваюцца таксама галоўная Р. і яе прыналежнасць (Р., якая служыць гал. Р. і звязана з апошняй агульным гасп. прызначэннем). Кожны з пазначаных падзелаў мае пэўныя юрыд. вынікі (гл. *Рэчавае права*).

РЭЧ ПАСПАЛІ́ТАЯ (польск. Rzecz Pospolita, Rzeczpospolita рэспубліка, агульная дзяржава, агульная справа), 1) традыцыйная назва Польскай дзяржавы, якая выражае суверэнныя адносіны народа (або класа, які прызнаны яго прадстаўніком) да дзяржавы. Упершыню тэрмін з'явіўся ў пач. 13 ст. ў хроніцы Вінцэнта Кадлубака. Шляхецкая Р.П. — прынятая ў гістарыяграфіі назва дзярж. сістэмы, што існавала ў Польшчы з сярэдзіны 15 ст. да 1795 (1-я Р.П.). Была формай саслоўнай манархіі на чале з выбарным пажыццёва каралём, уладу з якім падзяляла шляхта. Адроджаная ў 1918 Польская дзяржава 17.3.1921 прыняла афіц. назву Рэспубліка Польшча (Польская Рэч Паспалітая, Rzeczpospolita Polska, 2-я Р.П.). Назва захавалася да 1952, калі ўведзена найменне Польская Народная Рэспубліка (Polska Rzeczpospolita Ludowa) і адроджана 29.12.1989. Часам Р.П. называлася ў 15—16 ст. і *Вялікае княства Літоўскае*, а ў Статутах ВКЛ гэтым тэрмінам пазначаны паняцці «грамадства», «дзяржава». У 1-м раздзеле Статута ВКЛ 1588 пад тэрмінам «Р.П.» разумеліся «дзярж. справа», «дзярж. служба». У 16 ст. гэты тэрмін ужываўся ў значэнні «дзяржава».

2) Афіцыйная назва феад. федэратыўнай дзяржавы, у якую аб'ядналіся ў выніку *Люблінскай уніі 1569* Польшча (Карона) і ВКЛ (Княства, або Літва). Р.П. існавала ў 1569—1795 і была ліквідавана ў выніку 3 падзелаў яе тэрыторыі. У склад Кароны ўваходзілі польскія і ўкр. ваяводствы, у ВКЛ — бел. і літ. землі. У Р.П. ўваходзіла як сумесная ўладанне (кандамініум) Польшчы і ВКЛ Інфлянцкае ваяв. (гл. *Лівонія*), як васальная дзяржава — *Курляндскае герцагства*, як непасрэднае ўладанне Р. П. — Пілтэнскі пав. (на тэр. сучаснай Латвіі). У 1525—1657 васалам Польшчы было Прускае герцагства са сталіцай у Кралеўцы (Кёнігсбергу), аднак брандэнбургскім курфюрстам, якія з 1618 панавалі ў Прусіі, удалося дамагчыся яго незалежнасці.

Р.П. лічылася агульнай дзяржавай «абодвух народаў», г.зн. польскай і бел.-літ. шляхты. Кароль польскі (ён жа і вял. князь літоўскі, рускі і жамойцкі) меў абмежаваныя паўнамоцтвы. Заканадаўчую і часткова судовую ўладу меў агульны для ўсёй дзяржавы магнацка-шляхецкі *сойм*, які складаўся з 2 палат: Сената (з магнатаў, прадстаўнікоў цэнтр. і правінцыяльнай адміністрацыі, вярхоў каталіцкай царквы) і Пасольскай Ізбы, у якую выбіраліся шляхціцы-дэпутаты (паслы) па 2 ад кожнага павета. Прадстаўнікі Кароны складалі каля $^2/_3$ сойма. Аднак сойм прымаў законы асобна для Польшчы, асобна для ВКЛ. З 1673 кожны трэці звычайны сойм збіраўся на тэр. ВКЛ у Гродне. Р.П. вяла агульную для Кароны і ВКЛ знешнюю палітыку. Аднак абедзве дзяржавы захоўвалі асобную дзярж. адміністрацыю (з адпаведнымі кіруючымі пасадамі), асобныя войскі са сваім камандаваннем, свае фінансавыя сістэмы, скарб, права чаканкі аднолькавай манеты, самаст. судовыя і мытныя (да 1766) сістэмы, асобнае заканадаўства. Кожная з дзяржаў мела сваю дзярж. мову: Польшча — лацінскую (з канца 16 ст. фактычна польскую), ВКЛ — беларускую (з 1696 польскую, але афіцыйныя акты на бел. мове захоўвалі сваю моц). Згодна са Статутам ВКЛ 1588 польскай шляхце забаранялася ў ВКЛ займаць дзярж. пасады любога ўзроўню, а таксама купляць, атрымліваць у спадчыну і ў падарунак нерухомую маёмасць. З сярэдзіны 17 ст. роля соймаў паменшала, у паліт. жыцці Р.П. усё большую ролю пачалі адыгрываць магнацкія групоўкі і шляхецкія саюзы (*канфедэрацыі*). У кіраванні ўнутр. справамі Р.П. вырасла значэнне павятовых шляхецкіх соймікаў, якім было перададзена права збіраць некаторыя падаткі і распараджацца імі. Ва ўмовах частага зрыву соймаў, асабліва ў 18 ст., соймікі прысвойвалі сабе функцыі заканад. і суд. улады, не лічыліся з пастановамі сойма. Спробы цэнтралізацыі ўлады ў Р.П. у 2-й пал. 18 ст. не ўдаліся. *Канстытуцыя 3 мая 1791* з праграмай шырокіх рэформ дзярж. ладу была скасавана пасля перамогі *Таргавіцкай канфедэрацыі* у 1792. Тэрыторыя Р.П. у 1772, 1793 і 1795 была падзелена паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй (гл. *Першы падзел Рэчы Паспалітай*, *Другі падзел Рэчы Паспалітай*, *Трэці падзел Рэчы Паспалітай*).

Літ.: К у т ш е б а С. Очерк истории общественно-государственного строя Польши: Пер. с пол. СПб., 1907; Гісторыя Беларускай ССР. Т. 1. Мн., 1972; Б а р д а х Ю., Л е с н о д о р с к и й Б., П и е т р ч а к М. История государства и права Польши: Пер. с пол. М., 1980; Ю х о Я. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1992.

А.П.Грыцкевіч.

РЭ́ЧАВАЕ ПРА́ВА, суб'ектыўнае грамадзянскае права, аб'ектам якога з'яўляецца *рэч* (у праве). Асоба, якая валодае Р.п., ажыццяўляе яго самастойна. Уласнік рэчы валодае, карыстаецца і распараджаецца ёй паводле свайго меркавання ў межах, устаноўленых законам.

РЭЧАІ́СНАСЦЬ, аб'ектыўна рэальнае, актуальнае і наяўнае *быццё*. Р. адрозніваюць ад ідэальнага, нерэчаіснага зместу чалавечых вобразаў і паняццяў і патэнцыяльнага, магчымага быцця, якое яшчэ не ўзнікла, не стала наяўным. Складаецца са шматлікай колькасці матэрыяльных *прадметаў*, *з'яў*, *рэчаў* з іх

уласцівасцямі і адносінамі, якія знаходзяцца ў працэсах *развіцця* і змен. Да Р. адносяцца і прыродныя, і грамадска-гіст. з'явы, у т.л. каштоўнасці матэрыяльнай і духоўнай культуры. Таксама ўключае псіхафізіял. ўласцівасці людзей (магчымасць адлюстроўваць з'явы свету ў форме адчуванняў і звязаныя з імі ўспрынятце, уяўленні, паняцці, меркаванні, тэорыі і інш.), але ідэальны змест гэтых уласцівасцей да Р. не адносіцца: ён можа адпавядаць Р. ці скажаць правільнае ўяўленне аб ёй. Крытэрыем правільнага адлюстравання Р. ў *ідэях* з'яўляецца *практыка*.

Катэгорыя Р. выкарыстоўвалася яшчэ ў стараж.-грэч. філасофіі. Дэмакрыт проціпастаўляў Р. як «свет па ісціне» «свету па меркаванні». Платон разглядаў Р. як свет ідэальных сутнасцей, процілеглы пачуццёваму свету. У філасофіі 16—18 ст. Р. тлумачылася як сукупнасць матэрыяльных цел, якія аб'ектыўна існуюць у прасторы і часе і наглядна дадзены чалавеку ў адчуваннях. Г.В.Ф.Гегель прызнаваў у якасці Р. абсалютныя паняцці, якія аб'ектыўна існуюць і дыялектна развіваюцца ў сусв. розуме. Рас. філосафы М.А.Бярдзяеў, С.Л.Франк разглядалі Р. як абсалютнае (Божае) быццё і лічылі, што яго нельга даказаць, але трэба першапачаткова зыходзіць з яго; разам з тым яны прызнавалі першаснасць прадметнага быцця і сцвярджалі, што ўкаранёнасць чалавека ў гэтым быцці робіць магчымай яго свядомасць. Прадстаўнікі *экзістэнцыялізму* разглядалі Р. як перажыванне чалавекам свайго існавання. Бельг. фізік і філосаф І.Р.Прыгожын распрацаваў сінергетычны падыход у разуменні Р., якую разглядаў як самарэгулюемую сістэму, што грунтуецца на ўзаемапераходных працэсах хаосу і парадку, няўстойлівасці і ўстойлівасці, дэзарганізацыі і арганізацыі.

Панятце «Р.» цесна звязана з катэгорыяй магчымасці, якая з'яўляецца патэнцыяльнай Р., перадумовай Р. У развіцці пэўных з'яў Р. змешчана мноства нерэалізаваных магчымасцей. Іх рэалізацыя залежыць ад канкрэтных умоў, а часта ад выпадковых абставін развіцця Р. (гл. *Магчымасць і рэчаіснасць*). Працэсы рэалізацыі магчымасцей у Р. як самарэгулюемай сістэме даследуюцца ў *сінергетыцы*.

В.Дз.Марозаў.

РЭ́ЧКІ, вёска ў Іванцэвіцкім р-не Брэсцкай вобл., каля р. Вісліца. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 65 км на ПдУ ад горада і чыг. ст. Іванцэвічы, 200 км ад Брэста. 970 ж., 324 двары (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Царква (2000), малітоўны дом евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

РЭ́ЧЫВА, адзін з двух (нараўне з *полем фізічным*) відаў *матэрыі*. Складаецца з элементарных часціц (у асн. электронаў, пратонаў і нейтронаў) з масай (энергіяй спакою), не роўнай нулю. У зямных умовах вядомы 4 станы Р.: *газ*, *вадкасць*, *цвёрдае цела* і *плазма*, у белых карліках і *нейтронных зорках* Р. знаходзіцца ў звышшчыльным стане. У хіміі Р. прынята падзяляць на простыя, утвораныя атамамі аднаго хім. элемента (гл. *Простае рэчыва*), і складаныя (гл. *Злучэнне хімічнае*). Разнастайнасць фіз. і хім. уласцівасцей Р. абумоўлена эл.-магн. узаемадзеяннем паміж электронамі і ядрамі атамаў, а таксама паміж атамамі і малекуламі.

У класічнай фізіцы фіз. поле, якое мае неперарыўную структуру, процілеглася Р., якое складаецца з дыскрэтных утварэнняў. У квантавай механіцы ўстаноўлена, што кожны мікрааб'ект мае дваістую прыроду. Напр., электрон (часціца Р.) характарызуецца як карпускулярнымі, так і хвалевымі, а фатон (квант эл.-магн. поля) — хвалевымі і карпускулярнымі ўласцівасцямі (гл. *Карпускулярна-хвалевы дуалізм*). Выяўленне дыялектычнай узаемасувязі паміж уласцівасцямі Р. і поля прывяло да больш глыбокага разумення структуры матэрыі і дазволіла размежаваць паняцці Р. і матэрыі, якія атаясамліваліся ў навуцы на працягу многіх стагоддзяў.

Літ.: Вавилов С.И. Развитие идеи вещества // Собр. соч. М., 1956. Т. 3; Эрдэи-Груз Т. Основы строения материи: Пер. с нем. М., 1976.

А.І.Болсун.

РЭЧЫТАТЫ́Ў (італьян. recitativo ад recitare дэкламаваць), тып вакальнай, радзей інструм. мелодыкі, якая ўвасабляе інтанацыі, рытміку і агульную структуру натуральнай гаворкі, захоўваючы фіксаваны муз. строй; таксама назва раздзела ў оперы, кантаце, араторыі ў 17—19 ст., які папярэднічаў *арыі* (А.Скарлаці, І.С.Бах, В.А.Моцарт, Дж.Вердзі і інш.). Р. адрозніваюцца паводле моўнага прататыпу.

У фальклоры розных народаў — гэта абрадавыя песні, плачы-галашэнні і інш. Вылучаецца рэчытатыўная літургічная псалмодыя. У творах кампазітараў неапалітанскай опернай школы пач. 18 ст. склаліся 2 віды Р.: «secco», які імітаваў бытавую гаворку, і «accompagnato», арыентаваны на патэтычную тэатр. дэкламацыю. Р. у інстр. музыцы паявіўся пад уплывам оперы (Ф.Банпорці, Дж.Тарэлі, І.Кунаў і інш.). Пазней семантычныя магчымасці інстр. Р. ўзбагачаліся за кошт пераўтварэння ім новых інтанацыйных прататыпаў — культавай псалмодыі, фальклорных Р., кантрастнай і медытатыўнай унутр. мовы.

У бел. музыцы Р. прадстаўлены ў сольных і ансамблевых нумарах першых бел. опер (быў невыразны, часам пераважаў дэкламацыйны початак). Багатыя магчымасці Р. ў операх А.Багатырова, С.Картэса, Ю.Семянякі, Дз.Смольскага, А.Туранкова, Я.Цікоцкага, дзе ён гнутка адлюстроўвае эмац. стан герояў, адценні розных сітуацый у працэсе развіцця дзеяння. Магчымасці інстр. Р. шырока выкарыстаны ў бел. сімф. музыцы.

Літ.: Друскин М.С. Речитатив в русской классической опере // Друскин М.С. Исследования. Воспоминания. Л.; М., 1977; Володкович А.В. Народные белорусские речитативные жанры // Вопросы музыкознания. Мн., 1981; Златковский Ю.Д. К теории инструментального речитатива // Там жа; Яго ж. Проблемы анализа инструментального речитатива // Науч. тр. Бел. Акад. музыки. Мн., 1997. Вып. 5.

Ю.Дз.Златкоўскі.

РЭ́ЧЫЦА, горад абл. падпарадкавання, цэнтр Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл., на правым беразе р. Дняпро пры ўпадзенні ў яго р. Ведрыч; чыг. ст. на лініі Гомель—Калінкавічы; рачны порт; вузел аўтадарог на Гомель, Калінкавічы, Светлагорск, Жлобін, Лоеў, Хойнікі. За 50 км на З ад Гомеля. 66,8 тыс. ж. (2000).

Упершыню ўпамінаецца ў Густынскім летапісе пад 1213; у 1-м Наўгародскім летапісе Р. ў 1214 названа «чарнігаўскім» горадам, што быў разгромлены наўгародскім кн. Мсціславам. З 14 ст. ў складзе ВКЛ, у Мінскім ваяводстве. У 1392—1430 Р. валодаў вял. кн. ВКЛ Вітаўт. У жн. 1561 горад атрымаў ад вял. кн. ВКЛ і караля Польшчы Жыгімонта II Аўгуста няпоўнае магдэбургскае права. У 1569 Р. — цэнтр павета. У час *антыфеадальнай вайны 1648—51* горад некалькі разоў займалі казацка-сялянскія атрады. У 1648 Р. авалодаў 3-тыс. атрад, якому Б.Хмяльніцкі забараніў пакідаць горад як важны стратэгічны пункт, але ў 1649 яго адбіў Януш Радзівіл. У 1650 Р. заняў палкоўнік М.*Нябаба*, які таксама не ўтрымаў яе і быў забіты пры адступленні. Пасля *вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67* Р. страціла стратэгічнае значэнне, і яе ўмацаванні пачалі разбурацца. Паводле прывілея вял. кн. ВКЛ і караля Польшчы Аўгуста III ад 15.7.1734 Р. трапіла ва ўладанне кн. *Радзівілаў*. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) Р. ў Рас. імперыі, з 1795 павятовы

Горад **Рэчыца**. Забудова вуліцы Савецкай.

цэнтр Мінскай губ. У 1886 праз Р. пракладзены ўчастак Лунінец—Гомель *Палескіх чыгунак*, у 1890-я г. адкрыта прыстань. Паводле перапісу 1897 у Р. 9280 ж., у 1899 — 9332 ж., маслазавод, цагельня, 2 лесапільні і 2 піваварныя з-ды, прыходскае вучылішча, 2-класнае яўр. вучылішча, некалькі хедэраў, бальніца. У 1903—04 у Р. 205 рамесных прадпрыемстваў (857 рабочых). У 1904 у Р. створана арг-цыя РСДРП, якая ўваходзіла ў склад *Палескага камітэта РСДРП(б)*. У 1910 у Р. 6 фабрык і заводаў (363 рабочыя). З лют. 1918 да студз.1919 акупіравана герм. войскамі. У час *стракапытаўскага мяцяжу 1919* горад захапілі мяцежнікі. З 8.5 да 20.6.1920 акупіравана польскімі войскамі. У 1919—26 цэнтр *Рэчыцкага раёна* і *Рэчыцкай акругі* БССР, з 9.6.1927 да 26.7.1930 у Гомельскай акрузе, з 20.2.1938 у Гомельскай вобл., з 27.9.1938 горад абл. падпарадкавання. У 1939 29,8 тыс. ж. 28.8.1941 Р. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія загубілі ў Р. і раёне 3,8 тыс. чал. Дзейнічала *Рэчыцкае патрыятычнае падполле*. Вызвалена 18.11.1943 у ходзе *Гомельска-Рэчыцкай аперацыі 1943* войскамі Бел. фронту. У 1973 — 53,9 тыс. ж.

Прадпрыемствы машынабуд. і металлапр. (*Рэчыцкі суднабудаўніча-суднарамонтны завод*, *Рэчыцкі метызны завод*), харч. (з-ды піваварны, кансервавы, масла і сухога малака, кансервава-агароднінасушыльны, хлебазавод, камбінат збожжапрадуктаў, млын-камбінат), буд. матэрыялаў (*Рэчыцкі камбінат будаўнічых*

матэрыялаў, Рэчыцкі керамікa-трубны завод, *Рэчыцкі завод механічнай апрацоўкі драўніны*), хім. (*Рэчыцкі доследна-прамысловы гідролізны завод*, з-д «Тэрмапласт»), лёгкай (ільнозавод, ткацкае ВА, філіялы гомельскіх ВА — швейнага «Камінтэрн» і абутковага «Праца») прам-сці. Працуюць з-д маст. керамікі, газаперапрацоўчы з-д, раённыя аб'яднанні Дзяржкамсельгастэхнікі і «Сельгасхімія», райпрамкамбінат, камбінат быт. абслугоўвання. У горадзе *Рэчыцкі сельскагаспадарчы тэхнікум*, СПТУ-178, Дом дзіцячай творчасці, 9 б-к, *Рэчыцкі краязнаўчы музей*, філіял Дзярж. архіва Гомельскай вобл. Брацкія могілкі сав. воінаў і партызан, 4 брацкія магілы сав. воінаў і партызан, брацкая магіла падпольшчыкаў часоў Вял. Айч. вайны, 4 брацкія магілы ахвяр фашызму, магіла ахвяр мяцяжу 1919. Помнікі археалогіі: мезалітычнае паселішча і гарадзішча стараж. Р.

У канцы 12 ст. горад быў умацаваным пунктам на зямлі дрыгавічоў. У 13 ст. дзядзінец знаходзіўся на месцы гарадзішча ранняга жал. веку і эпохі Кіеўскай Русі на правым беразе р. Дняпро (цяпер у гар. парку). У 16 — 1-й пал. 17 ст. горад меў 3 лініі ўмацаванняў з цэнтрам — 5-вежавым *Рэчыцкім замкам*, абкружаным ровам і злучаным з астатняй ч. горада пад'ёмным мостам. У 1634 мінскі ваявода А.Слушка заснаваў у Р. кляштар дамініканцаў. У канцы 19 — пач. 20 ст. ў Р. былі 2 царквы — Успенская і Мікалаеўская (з 1723), Троіцкі касцёл, сінагога і некалькі яўр. малітоўных дамоў. У 1910 тут 1309 жылых пабудоў (з іх 4 мураваныя), 14 цэркваў і малітоўных дамоў. Паводле першага рэгулярнага плана (1800) склалася прамавугольная сістэма планіроўкі, якая ў працэсе развіцця дапоўнілася радыяльнай. Горад забудоўваўся паводле генпланаў 1937—39 (арх. Г.Парсаданаў), 1951 (арх. Парсаданаў, М.Томах, ін-т «Белдзяржпраект»), 1977 (БелНДІПгорадабудаўніцтва). У аснове генплана 2000 (БелНДІПгорадабудаўніцтва) закладзены прынцып функцыян. заніравання тэрыторыі. Асн. напрамкі развіцця горада — паўд., паўд.-ўсх., паўд.-зах., прадугледжаны таксама шырокі выхад яго да Дняпра. Агульнагар. цэнтр размяшчаецца ўздоўж цэнтр. ч. гал. вуліцы — Савецкай і абмежаваны вул. Чапаева і Авіяцыйнай. Горад мае пераважна 1- ці 2—3-павярховую сядзібную забудову. Асн. капітальная (шматкватэрная) забудова знаходзіцца па вул. Савецкай, у мікрараёнах і кварталах, прылеглых да яе ў цэнтр. і паўд.-ўсх. частках, а таксама па вул. Сняжкова, Маладзёжнай, Чапаева, Нафтавікоў і інш. Па вул. Савецкай і Набярэжнай захаваліся фрагменты забудовы 19 ст. Вытв. зоны — ва ўсх. і паўд.-зах. ч. Ствараецца адзіная сістэма ландшафтна-рэкрэацыйных тэр. уздоўж Дняпра і Вядрычы.

А.М.Бадзяка, М.А.Найшулер (архітэктура), *Т.С.Скрыпчанка* (гісторыя).

РЭ́ЧЫЦА, рабочы пасёлак у Столінскім р-не Брэсцкай вобл., чыг. ст. Гарынь на лініі Лунінец—Сарны (Украіна) на аўтадарозе Столін—Сарны. За 7 км на Пд ад Століна, 238 км ад Брэста. 6,8 тыс. ж. (2000).

У 19 ст. вёска Столінскай вол. Пінскага пав. У 1886 — 332 ж., 31 двор, царква. З пабудовай чыгункі Лунінец—Роўна (1885) чыг. ст. Гарынь. У 1921 — 39 у складзе Польшчы, вёска Столінскага пав. Палескага ваяв., 948 ж. (1921). З 1939 у БССР, з 1940 у Столінскім р-не Пінскай вобл., з 1954 Брэсцкай вобл. З 6.7.1960 рабочы пасёлак.

Працуюць з-ды: абліцовачна-фасаднай керамікі, кансервавы, камбінат буд. матэрыялаў, лесазавод, раённае аб'яднанне сельгастэхнікі, камбінат быт. абслугоўвання; 3 сярэднія і сярэдняя вочна-завочная школы, 4 дашкольныя ўстановы, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі, цэрквы — правасл., хрысціян веры евангельскай, хрысціян баптыстаў-евангелістаў. Брацкая магіла сав. воінаў.

РЭ́ЧЫЦА, вёска ў Камянецкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на У ад г. Камянец, 51 км ад Брэста, 16 км ад чыг. ст. Тэўлі. 271 ж., 93 двары (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў, помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — Свята-Успенская царква (1873).

РЭ́ЧЫЦА, вёска ў Чэрыкаўскім р-не Магілёўскай вобл., каля р. Волчас, на аўтадарозе Чэрыкаў—Крычаў. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на ПнУ ад г. Чэрыкаў, 89 км ад Магілёва, 17 км ад чыг. ст. Крычаў. 503 ж., 183 двары (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызана. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

РЭ́ЧЫЦКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў жн. 1941 — ліст. 1943 у г. *Рэчыца* Гомельскай вобл. Складалася з 5 груп (40 чал.): у друкарні (кіраўнік І.Дз.Усхопаў), канторы «Заготжывёла» (Д.В.Мыткін), гар. управе (М.У.Жыленка), драмтэатры (Г.С.Хумар'ян), камсамольска-маладзёжная на чыг. ст. (П.М.Маркаль). Мела сувязь з партызанамі Рэчыцкай брыгады, укр. злучэння С.А.Каўпака, падп. Гомельскім абкомам і Рэчыцкім райкомам ЛКСМБ. Падпольшчыкі здабывалі для партызан разведданыя, перадавалі ім прадукты харчавання, медыкаменты, бланкі акупац. дакументаў, паперу, друкавалі лістоўкі, праводзілі дыверсіі. У барацьбе супраць ням. фашыстаў загінула 16 падпольшчыкаў. У Рэчыцы на іх магіле помнік.

М.Ф.Шумейка.

РЭ́ЧЫЦКАЕ РАДО́ВІШЧА НА́ФТЫ. За 10 км на ПдЗ ад г. *Рэчыца* Гомельскай вобл. Першае нафтавае радовішча, адкрытае на Беларусі (1964). Распрацоўваецца з 1965. 6 пакладаў нафты прымеркаваны да міжсалявых (ялецкі, задонскі гарызонты), падсалявых карбанатных (варонежскі, сямілуцкі) і падсалявых тэрыгенных (ланскі і верхнепратэразойскі) адкладаў. Асн. ч. разрэзу (да 80%) складаюць верхне- і сярэднедэвонскія адклады. Рэчыцкая структура на паверхні падсалявых адкладаў уяўляе сабой паўантыклінальную складку памерамі 16 4 км, на паверхні міжсалявых адкладаў — антыклінальную складку памерамі 12 4 км. Размешчана на Пн Прыпяцкага прагіну ў межах Рэчыцка-Вішанскай тэктанічнай зоны, разам з Асташкавіцкім, Цішкаўскім, Паўд.-Асташкавіцкім, Чырванасельскім і Дняпроўскім радовішчамі. Глыб. залягання нафтаносных гарызонтаў 1900—2800 м. Пароды-калектары — трэшчынава-каверна-поравыя даламіты і вапнякі і кварцава-палевашпатавыя розназярністыя пясчанікі, алеўраліты. Шчыльн. нафты павялічваецца знізу ўверх ад 805 кг/м^3 у верхнепратэразойскім пакладзе да 890 кг/м^3 у міжсалявым. Адпаведна павялічваецца колькасць серы (ад 0,2 да 1%), парафіну (ад 2,8 да 10%) і смол (ад 6 да 24,5%). Спадарожны газ выкарыстоўваецца прамысл. прадпрыемствамі Рэчыцкага і Светлагорскага р-наў. Здабыта 25 млн. т нафты (каля 80% пач. запасаў, якія здабываюцца, 2000).

Я.Г.Грыбік.

РЭ́ЧЫЦКАЕ РАЁННАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў жн. 1941 — ліст. 1943 у Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл. Складалася з 8 груп (62 чал.) у вёсках Андрэеўка і Пасека (кіраўнікі Рыгор Іванавіч і Рыгор Ісакавіч Васільцы), Вятхінь (М.Л.Саламаха), Гарноўка (Ю.А. і В.А. Раціборскія), Міларад (З.А.Грабянчук), Ровенская Слабада (А.Ц.Дворнік, М.І.Звяртоўскі), Свірыдавічы (А.В.Карбаценка, В.А.Нямкевіч), 2 групы ў в. Холмеч і Завужаль (Ф.П.Севераў, М.С.Вайтовіч, М.Ф.Яўланчык). Падпольшчыкі мелі сувязь з групай, пакінутай у раёне па заданні ЦК КП(б)Б, са створаным на яе базе партыз. атрадам імя Варашылава і атрадам «За Радзіму», здабывалі для іх разведданыя, дапамагалі зброяй, боепрыпасамі, харч. прадуктамі, праводзілі дыверсіі. Вялі агітацыю сярод насельніцтва, што спрыяла хуткаму росту партыз. сіл раёна. У барацьбе супраць ням. фашыстаў загінула 10 падпольшчыкаў. У г. Васілевічы Рэчыцкага р-на помнік у гонар загінуўшых падпольшчыкаў.

М.Ф.Шумейка.

РЭ́ЧЫЦКАЯ АКРУ́ГА, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1926—27. Утворана 8.12.1926. Цэнтр — г. *Рэчыца* Гомельскай вобл. Пл. 8,3 тыс. км^2, нас. 155 тыс. чал. (1926). Уключала 9 раёнаў: Брагінскі, Васілевіцкі, Горвальскі, Камарынскі, Лоеўскі, Рэчыцкі, Хойніцкі, Холмецкі, Юравіцкі; падзялялася на 242 сельсаветы, 1 горад (Рэчыца) і 2 мястэчкі (Брагін, Хойнікі). 12.4.1927 скасавана, 9.6.1927 Юравіцкі р-н уключаны ў *Мазырскую акругу*, астатнія — у *Гомельскую акругу*.

РЭ́ЧЫЦКАЯ ВОЛАСЦЬ, Рэчыцкае староства, буйны дзярж. маёнтак у ВКЛ у 15—18 ст. Цэнтр — г. Рэчыца. Першапачаткова ўваходзіла ў склад Чарнігаўскага княства, уключала мястэчкі Стрэшын, Горваль, Дамыслін і інш., якія вял. князі ВКЛ раздалі духоўным і свецкім феадалам. Паводле адм. рэформы 1565—66 увайшла ў склад Рэчыцкага пав. У 1569 уключана ў «сталовыя» маёнткі, даход з якіх ішоў на забеспячэнне вял. князя і яго двара. У

выніку 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) далучана да Рас. імперыі.
В.Л.Насевіч.

РЭ́ЧЫЦКАЯ ЗАПА́ЛКАВАЯ ФА́БРЫКА «Д н е п р». Дзейнічала ў г. *Рэчыца* Гомельскай вобл. ў 1908—10. У 1908 мела лакамабіль, працавала 79 рабочых. У 1910 выраблена 787 тыс. скрынак запалак.

РЭ́ЧЫЦКАЯ КЕРА́МІКА, традыцыйныя ганчарныя вырабы майстроў з г. Рэчыца Гомельскай вобл. Промысел вядомы з даўніх часоў (выраблялі чорназдымлены і паліваны посуд). У 1930-я г. на базе саматужных ганчарных промыслаў створаны прамкамбінат, які вырабляў сталовы і гасп. посуд шырокага асартыменту (гаршкі, збаны, макотры, слаі, міскі, гладышы, глякі, вазы, талеркі, спарышы-дваякі, -траякі і інш.), дэкар. пластыку, цацкі. Посуд вызначаўся простымі формамі, чырвоным колерам, рознымі памерамі («варэйка» — 10 л, «стаўбун» — 8 л, «абеднік» — 3—4 л, «падабеднік» — да 2 л, «малочнік» — 0,5 л і інш.). Некат. вырабы арнаментавалі выціскам, малюнкам у выглядзе гронак вінаграду. З 1979 Рэчыцкі з-д маст. керамікі, з 2001 з-д «Рэчыцкая кераміка» выпускае гасп. посуд з ангобнай размалёўкай, арх. дэкар. тэракотавыя вырабы. Сярод майстроў А.Варэнік, Н.Грамыка, Р.Быліна. *У.В.Угрыновіч.*

РЭ́ЧЫЦКІ ДО́СЛЕДНА-ПРАМЫСЛО́ВЫ ГІДРО́ЛІЗНЫ ЗАВО́Д. Уведзены ў эксплуатацыю і даў першую прадукцыю ў 1931 у г. *Рэчыца* Гомельскай вобл. як Бел. дубільна-экстрактавы з-д. У Вял. Айч. вайну каштоўнае абсталяванне эвакуіравана на Шумерлінскі з-д «Дубіцель» (Чувашыя). У 1943—46 выпуск прадукцыі адноўлены, у 1953 рэканструяваны. З 1957 — з-д дубільных экстрактаў, з 1963 — гідралізна-дражджавы з-д. У 1965—71 пабудавана гідралізна-дражджавая вытв-сць. З 1983 — сучасная назва. У 1986—90 гідралізна-дражджавая вытв-сць пераабсталявана. З 1992 выпускае тэхн. фурфурол. Асн. прадукцыя (2001): дрожджы кармавыя, тэхн. фурфурол і фурфурол-сырэц, экстракт дубовы дубільны, тавары нар. ўжытку (паркет, дошкі для падлогі і інш.).

РЭ́ЧЫЦКІ ЗАВО́Д МЕХАНІ́ЧНАЙ АПРАЦО́ЎКІ ДРАЎНІ́НЫ. Дзейнічаў у г. *Рэчыца* Гомельскай вобл. з 1903 як лесапільнае і фанернае прадпрыемства, з 1911 — з-д мех. апрацоўкі драўніны. З 1908 уваходзіў у акц. т-ва лесафанерных з-даў. Меў паравы рухавік. Выпрабляў дошкі, з 1908 альховую клееную фанеру. У 1913 працавала ад 40 да 150 рабочых.

РЭ́ЧЫЦКІ ЗА́МАК. Існаваў у 16 — 1-й пал. 17 ст. ў г. *Рэчыца* Гомельскай вобл. Пабудаваны з дрэва на высокім пагорку правага берага Дняпра на месцы старажытнага гарадзішча пл. каля 1 га. Быў абнесены валам і абведзены ровам. Умацаванне авальнага ў плане замка складалася з драўляных абарончых сцен, зробленых па тыпу гародняў з 1 ярусам бою, 5 шматгранных і квадратных у плане вежаў, накрытых невысокімі шатровымі дахамі. Уезд у замак быў з ПдЗ праз пад'ёмны мост. Р.з. разбураны ў 1649 у час *антыфеадальнай вайны 1648—51*. Вядомы паводле плана і гравюры 1649.
Літ.: Егоров Ю. Градостроительство Белоруссии. М., 1954. С. 77. *Ю.А.Якімовіч.*

Аўтар В.Л.Насевіч

Рэчыцкая кераміка. Бытавы ганчарны посуд. 1980.

РЭ́ЧЫЦКІ КАМБІНА́Т БУДАЎНІ́ЧЫХ МАТЭРЫЯЛА́Ў. Пабудаваны ў 1952—56 у г. *Рэчыца* Гомельскай вобл. як камбінат па вытв-сці каналізацыйных труб. У 1971 перайменаваны на Рэчыцкі керамічна-трубны з-д. У 1971—91 у Гомельскім вытв. аб'яднанні па выпуску буд. матэрыялаў. З 1991 сучасная назва. Сыравіна — гліна радовішча Гарадок (Лоеўскі р-н Гомельскай вобл.), часткова прывазная. Структура прадпрыемства ўключае: гал. вытворчы цэх (участкі па вытв-сці керамічнай цэглы і каналізацыйных керамічных труб); дапаможныя цэхі — рамонтна-механічны, рамонтна-будаўнічы, аўтатранспартны; парасілавую — газавую гаспадарку; кар'ер Гарадок. Асн. прадукцыя (2001): трубы каналізацыйныя керамічныя (дыяметр 300, 200, 150 мм), цэгла керамічная паўнацелая (маркі 150, 100, 75), паслугі насельніцтву.

РЭ́ЧЫЦКІ КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Засн. ў 1952, адкрыты ў 1954 (у 1962—64 не працаваў) у г. *Рэчыца* Гомельскай вобл. Пл. экспазіцыі 377 м^2, больш за 21 тыс. экспанатаў асн. фонду, 3 аддзелы, выставачная зала (2002). Сярод экспанатаў каменныя і крамянёвыя прылады працы, жаночыя ўпрыгожанні 7—3 ст. да н.э. з археал. помнікаў раёна, скарбы манет ВКЛ і Рэчы Паспалітай, інтэр'ер сял. хаты і нац. адзенне пач. 20 ст., матэрыялы пра падзеі ваеннай інтэрвенцыі 1918—20, калектывізацыю, рэпрэсіі 1930—50-х г., пра стварэнне і дзейнасць падполля і партыз. руху ў Вял. Айч. вайну, злачынствы ням. фашыстаў, агучаная дыярама пра фарсіраванне сав. войскамі Дняпра на Пд ад Рэчыцы. У экспазіцыі матэрыялы пра землякоў — Герояў Сав. Саюза, удзельнікаў вайны ў Афганістане 1979—89, удзельнікаў ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС у 1986 і інш. Музей праводзіць выстаўкі твораў прафес. і самадз. мастакоў, вырабаў нар. ткацтва, дзіцячай творчасці, дэкар.-прыкладнога мастацтва і інш., выпускае буклеты пра гіст. мінулае горада і раёна. *І.А.Шафір.*

РЭ́ЧЫЦКІ МЕТЫ́ЗНЫ ЗАВО́Д. Засн. ў 1912 у г. *Рэчыца* Гомельскай вобл. на базе лесапільнай вытв-сці купцамі Б. і У. Рык як дротава-цвіковы завод «Прыдняпроўскі». Выпускаў да 30 пудоў цвікоў за суткі. У 1917 з-д нацыяналізаваны. У грамадзянскую вайну часткова разбураны. Адноўлены ў 1920, з 1927 дротава-цвіковы з-д імя Інтэрнацыянала. У 1940 выпрабляў 27 т цвікоў за суткі.


Рэчыцкі замак. Гравюра 1649.

У 1941 гал. вузлы і агрэгаты эвакуіраваны ў г. Ніжні Ноўгарад і Барнаул. У Вял. Айч. вайну будынкі разбураны. Адноўлены ў 1943. У 1945 выпусціў 1000 т цвікоў і шрубаў. З 1959 сучасная назва. Мае 5 асн. цэхаў (сталядротавы, крапежны, спец. крапежных вырабаў, цвіковы, тавараў нар. ужытку), 3 дапаможныя (аўтацэх, падрыхтоўкі вытв-сці і інструментальны). Вытв-сць тэхнічна пераабсталявана, устаноўлены высокапрадукц. аўтаматы. Асн. прадукцыя (2001): дрот, цвікі, крапежныя вырабы (балты, гайкі, шрубы, вінты нармальнай і павышанай дакладнасці, шайбы, заклёпкі), шплінты. *А.С.Вашкоў.*

РЭ́ЧЫЦКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка ў ВКЛ, Рас. імперыі і БССР у 16—20 ст.

Утвораны ў 1566 у складзе Мінскага ваяв. ВКЛ. Цэнтр — г. *Рэчыца* Гомельскай вобл. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай скасаваны, яго тэр. 23.4.1793 падзелена паміж Мінскай, Магілёўскай і Чарнігаўскай губ. 29.10.1796 адноўлены на тэр., што ўвайшла ў Чарнігаўскую губ., з далучэннем часткі б. Кіеўскага ваяв. З 12.12.1796 у складзе Малапрасійскай губ., з 29.8.1797 у Мінскай губ., да яго далучана частка прылеглых тэр. Мазырскага пав. У 1886 пл. павета 10,85 тыс. км², нас. 110 тыс. чал. Уключаў 23 воласці: Аравіцкую, Аўюцевіцкую, Брагінскую, Васілевіцкую, Горвальскую, Даманавіцкую, Дзёрнавіцкую, Дзяржыцкую, Дудзіцкую, Ёлчанскую, Заспенскую, Карпавіцкую, Крукавіцкую, Лоеўскую, Маладушскую, Мікуліцкую, Нараўлянскую, Ровенскаслабодскую, Ручаёўскую, Савіцкую, Хойніцкую, Холмецкую, Юравіцкую; 405 вёсак. У 1894 — 52 мястэчкі (найб. значныя Лоеў, Горваль, Брагін), 861 гандл. прадпрыемства, 34 пачатковыя і царк.-прыходскія школы, некалькі школ граматы і хедэраў, 5 цэркваў, 3 касцёлы, некалькі яўр. малітоўных школ, 2 бальніцы, 4 прыёмныя пакоі, 7 аптэк, 6 паштова-тэлеграфных і 5 паштовых устаноў. З 26.4.1919 у *Гомельскай губерні* РСФСР. У 1923 воласці ўзбуйнены, іх стала 14. У 1924 і 1926 павет часткамі перададзены ў БССР. У снеж. 1926 скасаваны, яго тэр. ўключана ў Мазырскую і Гомельскую акругі.

В.Л.Насевіч, Т.С.Скрыпчанка.

Аўтар В.Л.Насевіч

РЭ́ЧЫЦКІ РАЁН. У цэнтры Гомельскай вобл. Утвораны 8.12.1926. Пл. 2,7 тыс. км². Нас. 46 тыс. чал. (2001, без райцэнтра), гарадскога 12,8%. Сярэдняя шчыльн. 17 чал. на 1 км². Цэнтр — г. *Рэчыца*. Уключае г. *Васілевічы*, г.п. *Зарэчча*, 189 сельскіх населеных пунктаў, Васілевіцкі гарадскі Савет, Зарэцкі пасялковы Савет, 20 сельсаветаў: Азершчынскі, Артукоўскі, Бабіцкі, Баршчоўскі, Белабалоцкі, Вышамірскі, Глыбаўскі, Дземяхоўскі, Дуброўскі, Жмураўскі, Заспенскі, Камсамольскі, Капараўскі, Караваціцкі, Ліскаўскі, Новабарсуцкі, Перасвятоўскі, Ровенскаслабодскі, Свірыдавіцкі, Холмецкі.

НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ

паводле адміністрацыйнага значэння: Цэнтры паветаў; Цэнтры буйнейшых уладанняў (валасцей); Іншыя населеныя пункты

паводле тыпу паселішча: РЭЧЫЦА Гарады; Рагачоў Мястэчкі; *Целяшы* Вёскі

паводле прыналежнасці

МЕЖЫ: Рэчы Паспалітай; ваяводстваў; паветаў; Вялікага княства Літоўскага; Сучасная граніца Рэспублікі Беларусь

ЛІЧБАМІ НА КАРЦЕ ПАЗНАЧАНЫ ВЁСКІ:

А-1: *1 Любонічы, 2 Уласавічы, 3 Мішкавічы, 4 Глыбокавічы, 5 Паўлавічы, 6 Дзяранкавічы, 7 Жылічы, 8 Кавалёва, 9 Жарабцы, 10 Вітлін, 11 Варатын, 12 Жалвінец*; А-2: *13 Добры Дуб, 14 Хатоўня, 15 Хвалевічы, 16 Касцяшова, 17 Вішчын, 18 Свяржаны, 19 Асмоловічы, 20 Забалоцце, 21 Мазалава, 22 Лучын, 23 Сенажаткі, 24 Казловічы, 25 Мірковічы, 26 Глыбочыца*; Б-1: *27 Зубарэвічы, 28 Ратмеравічы*; Б-2: *29 Чабатовічы*; Б-3: *30 Шарсцін, 31 Навасёлкі, 32 Дзямяновічы, 33 Плеса*

Аўтар карты М.Ф.Спірыдонаў



Тэр. раёна ў межах *Прыдняпроўскай нізіны*. Паверхня пераважна пласкахвалістая з выступамі марэнных град і ўзгоркаў на З, забалочанымі плоскімі паніжэннямі і ўчасткамі дзюнна-ўзгоркавых форм на У. Пераважаюць выш. 130—140 м (75% тэр.), найвыш. пункт 161 м (за 2 км на Пд ад в. Камсамольск). Агульны нахіл з ПнЗ на ПдУ. Карысныя выкапні: нафта і спадарожны гаручы газ (асн. раён здабычы на Беларусі, гл. *Рэчыцкае радовішча нафты*), торф, пяскі, пясчана-жвіровы матэрыял, гліны і суглінкі. Сярэдняя т-ра студз. -6,7 °С, ліп. 18,5 °С. Ападкаў 609 мм за год. Вегетац. перыяд 194 сут. Найб. р. Дняпро з прытокамі Бярэзіна і Ведрыч з Днепрыкам. Каналы: Кербіцкі, Нізавы, Рэчыцкі (усе часткова), Ветхінскі, Перавалоц-

кі, Бонда і інш. Пераважаюць глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (27,5%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (27,1%), тарфяна-балотныя (17,6%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (16,2%), поймавыя (алювіяльныя, 11,5%). Пад лесам 46% тэрыторыі. Пераважаюць лясы хваёвыя, бярозавыя, чорнаальховыя, дубовыя, радзей трапляюцца асінавыя, грабавыя, яловыя і інш. Штучныя насаджэнні (30,8%) пераважна хваёвыя. Балоты займаюць 3% тэр. раёна. Найб. балотныя масівы Васілевічы-1, Шэўб-Кабылёва, Крапіўніцкае балота, Шчыгус, Белае-Пагарэлец, Янаўскае балота. У межах раёна ландшафтны заказнік рэсп. значэння *Смычок*, біял. заказнік мясц. значэння Закрашынскі Мох. Помнікі прыроды рэсп. значэння — дуброва ва Узнажскім лясніцтве, мясц. значэння — дуброва ў Баршчоўскім і ясеннікі ў Васілевіцкім і Караваіцкім лясніцтвах.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 93 тыс. га, з іх асушаных 44,6 тыс. га. На 1.1.2001 у раёне 15 калгасаў, 8 камунальных с.-г. прадпрыемстваў, с.-г. прадпрыемства «Дземяхі», племзавод «Ведрыч», падсобная гаспадарка «Крынкі» Гомельскага аддз. Бел. чыгункі, прадпрыемства меліярацыйных сістэм «Рэчыцкае ПМС», аграхім. лабараторыя, насенная інспекцыя і міжраённая льнонасенстанцыя. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, ільнаводстве, вырошчванні збожжавых, кармавых і пладова-ягадных культур, бульбы, агародніны. Прадпрыемствы харч. (спірт, канцэнтрат кваснага сусла, крухмал, кісель, хлебапрадукты, камбікорм, жытняя мука), першаснай апрацоўкі лёну (ільнавалакно), металаапр. (запчасткі для с.-г. машын) прам-сці, аблспажыўсаюза (кансервы з агародніны і мяса, мінер. вада і вінныя напіткі); Васілевіцкі і Рэчыцкі лясгасы (аднаўленне і догляд лясных насаджэнняў, дрэваапрацоўка); ААТ «Буравая кампанія «Дэльта» (свідравіны на ваду). Па тэр. раёна праходзяць: чыг. Гомель—Калінкавічы, аўтамагістраль Расія—Гомель—Кобрын, аўтадарогі Рэчыца—Парычы, Рэчыца—Хойнікі і Рэчыца—Лоеў. Суднаходства па рэках Дняпро і Бярэзіна. У раёне 27 сярэдніх, 11 базавых, 5 пач., 4 муз., 2 спарт. школы, дзіцячая школа мастацтваў, школа-інтэрнат, 2 спецшколы, Дом дзіцячай творчасці, ПТВ, с.-г. тэхнікум, 32 дашкольныя ўстановы, 59 сельскіх дамоў культуры і клубаў, 56 б-к, 6 бальніц, 2 дыспансеры, 3 паліклінікі, 4 амбулаторыі, 44 фельч.-ак. пункты, 3 санаторыі-прафілакторыі. Ровенскаслабодскі музей баявой і працоўнай славы. Выдаецца газ. «Дняпровец».

Н.І.Грабцэвіч, Г.С.Смалякоў.

РЭ́ЧЫЦКІ СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧЫ ТЭ́ХНІКУМ. Засн. ў 1957 як зоаветэрынарны тэхнікум. З 1983 саўгас-тэхнікум, з 1997 с.-г. тэхнікум. Спецыяльнасці (2000/01 навуч. г.): заатэхнія, ветэрынарыя. Прымае асоб з базавай і сярэдняй адукацыяй. Навучанне дзённае і завочнае.

РЭ́ЧЫЦКІ СУДНАБУДАЎНІ́ЧА-СУДНАРАМО́НТНЫ ЗАВО́Д. Засн. ў 1931 у г. *Рэчыца* Гомельскай вобл. у сутоках рэк Дняпро і Ведрыч як прадпрыемства «Суднаверф», дзе будавалі і рамантавалі драўляныя несамаходныя баржы. У Вял. Айч. вайну прадпрыемства разбурана. Пасля аднаўлення будавалі драўляныя, з 1956 метал. баржы. З 1979 — сучасная назва. З-д рэканструяваны, уведзены ў эксплуатацыю блок цэхаў, аснашчаны сучасным абсталяваннем, перадавымі тэхналогіямі. У пач. 1990-х г. з-д супрацоўнічаў з галанд. фірмамі, будавалі судны тыпу «рака—мора». Асн. прадукцыя (2001): буд-ва і рамонт несамаходных метал. суднаў, выраб нестандартнага абсталявання.

РЭ́ЧЫШЧА, найбольш паніжаная частка рачной *даліны*, па якой адбываецца сцёк вады ў міжпаводкавыя перыяды. Шырыня Р. буйных рэк ад дзесяткаў і сотняў метраў да некалькіх кіламетраў. Па даўжыні Р. *плёсы* чаргуюцца з *перакатамі*. Для Р. раўнінных рэк характэрны *рукавы*, *меандры* і рэчышчавыя ўтварэнні (*астравы*, *асяродкі*, *косы*, *мелі*, *пляжы* і інш.). Р. горных рэк парожыстыя, часта скалістыя. Пры разводдзях і паводках вада не ўмяшчаецца ў Р. і выходзіць на *пойму*. У гэтыя перыяды фарміруюцца *прырэчышчавыя валы*, адбываецца найб. эразійная работа рэк, што можа выклікаць істотныя змены ў мікрарэльефе і форме Р. У засушлівых раёнах Р. многіх рэк б.ч. года застаюцца сухімі. Для рэк Беларусі характэрны Р. раўнінных і нізінных рэк — звілістыя, месцамі падзеленыя на рукавы, часта суправаджаюцца *пратокамі*, *старыцамі*. Шыр. Р. пераважна 10—20 м, у ніжніх цячэннях 30—50 м. Шыр. Р. буйных рэк звычайна 80—120 м, месцамі да 300—500 м. Глыбіні большасці Р. 0,3—1 м, на плёсах 1—4 м, месцамі да 6—8 м.

Да арт. **Рэчышча**. Формы рэчышчавых утварэнняў.

РЭ́ШАТАЎ Павел Дзмітрыевіч (26.8.1911, в. Бегунова Цвярской вобл., Расія — 27.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1945). Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну з 1942 на фронце. Кулямётнае аддзяленне на чале з сяржантам Р. вызначылася 27.6.1944 у баі каля в. Абухава Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл. пры спробе ворага вырвацца з *віцебскага «катла»*, дзе знішчыла большую частку яго калоны. Калі Р. застаўся адзін, то апошняй гранатай падарваў сябе і фашыстаў. У в. Уна Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. помнік.

П.Дз.**Рэшатаў**.

РЭ́ШАЦІЛАЎ Анатоль Радзівонавіч (н. 14.10.1934, с. Грыгор'еўка Мацвеева-Курганскага р-на Растоўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне сістэм кіравання. Д-р тэхн. н. (1991), праф. (1993). Скончыў Разанскі радыётэхн. ін-т (1963). З 1968 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі. Навук. працы па даследаванні вымушаных ваганняў у нелінейных сістэмах. Устанавіў новы клас сістэмных характарыстык нелінейных звёнаў устройстваў кіравання. Распрацаваў крытэрый устойлівасці вымушаных ваганняў, метад разліку каардынат ваганняў у нелінейных сістэмах адвольнай канфігурацыі.

Тв.: Системные характеристики нелинейных звеньев и скачки колебаний. Мн., 1986.

РЭ́ШАЦЬ Язэп (28.7.1890, в. Рушчаны, Віленшчына — 15.2.1958), бел. рэліг. і культ.-асв. дзеяч. Д-р філасофіі і тэалогіі. Скончыў Віленскую духоўную каталіцкую семінарыю (1913). Вучыўся ў Грыгарыянскім ун-це ў Рыме (1913—19), папскім Усх. ін-це (1919—21) і ў Collegium Germanicum. Пасвячоны ў святары ў 1917 у Рыме. Пасля вяртання на радзіму ў 1921 вікарый-кааператар у Гродне, потым праф. філасофіі і апалагетыкі Віленскай духоўнай каталіцкай семінарыі, выкладаў патрыстыку ў Віленскім ун-це імя С.Баторыя і Закон Божы ў Віленскай бел. гімназіі. Прымаў удзел у зах.-бел. нац.-рэліг. жыцці. У складзе бел. дэлегацыі ўдзельнічаў у працы 5-га Уніяцкага кангрэса ў Велеградзе (Чэхаславакія, 1927). Член рэдкалегіі час. *«Хрысціянская думка»*. У 1938 выехаў у Паўн. Амерыку, дзе ўступіў у ордэн бенедыкцінцаў у абацтве св. Пракопа (каля Чыкага). Аўтар рэліг. і навук. кніг — «З хрысціянскай апалагетыкі», «Святыя», «Кароткі катэхізіс для беларусаў-католікаў».

Літ.: Беларускія рэлігійныя дзеячы XX ст.: Жыццярысы, мартыралогія, успаміны. Мн.; Мюнхен, 1999. *Ю.Гарбінскі.*

РЭШТ, горад на ПнЗ Ірана. Адм. ц. астана Гілян. Каля 400 тыс. ж. (2000). Вузел аўтадарог. Аэрапорт. Цэнтр раёна

шаўкаводства (з 14 ст.). Прам-сць: тэкст., харчасмакавая (у т.л. тытунёвая, чаеперапрацоўчая), дрэваапр., эл.-тэхн., шкляная. Рамёствы (разьба па дрэве, маст. апрацоўка металаў, вышыўка). Ун-т.

РЭ́ШЫЦА (Reşiţa), горад на З Румыніі. Адм. ц. жудзеца Караш-Северын. Каля 100 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: металургічная, цяжкае машынабудаванне, коксахім., швейная, харчовая. У наваколлі — здабыча кам. вугалю і жал. руды. Музей металургіі.

РЭЮНЬЁН (Réunion), уладанне Францыі (заморскі дэпартамент) на аднайменным в-ве з групы Маскарэнскіх а-воў у зах. ч. Індыйскага ак. Уваходзяць а-вы Рэюньён (пл. 2350 км²), Трамлен, Басас-да-Індыя, Жуан-ды-Нова і Еўропа. Агульная пл. 2,5 тыс. км². Нас. 720,9 тыс. чал. (2000). Дзярж. мова — франц., выкарыстоўваюцца крэольская і хіндзі. Адм. ц. — г. *Сен-Дэні*. Падзяляецца на 24 камуны. Нац. свята — Дзень узяцця Бастыліі (14 ліп.).

Прырода. В-аў Р. складаецца з 2 вулканічных масіваў: паўн.-зах. з патухлым вулканам Пітон-дэ-Неж (выш. 3069 м) і паўд.-ўсх. з дзеючым вулканам Фурнез (выш. 2631 м). Ёсць голыя лававыя палі, стараж. вулканічныя цыркі, участкі плато; узбярэжжы нізінныя і раўнінныя. Клімат трапічны пасатны. На ўзбярэжжы т-ры паветра ад 28 °С у студз. да 20 °С у ліп. На падветраных паўн.-ўсх. схілах гор выпадае да 4000 мм ападкаў за год, на ПдЗ — каля 700 мм. Шмат кароткіх горных рэк. Бываюць разбуральныя ўраганы (снеж.—красавік). Пад лесам (тамарынд, жалезнае і аліўкавае дрэвы, дрэвападобныя папараці і ліяны) і хмызнякамі 35% тэр. На ПдЗ участкі саваннаў, у гарах — лугі. Шмат птушак. Разнастайная марская фауна. Ёсць некалькі рэзерватаў.

Насельніцтва. Асн. насельніцтва (больш за 60%) — рэюньёнцы, або крэолы, народ пераважна змешанага франка-афрамалагасійскага паходжання, нашчадкі франц. каланістаў, афр. і малагасійскіх рабоў. Жывуць таксама індыйцы (каля 27%), афрыканцы, мальгашы, кітайцы. Сярод вернікаў пераважаюць католікі (86%), ёсць індуісты, мусульмане, будысты. Сярэднегадавы прырост нас. каля 1,7%. Сярэдняя шчыльн. каля 288 чал. на 1 км². Амаль усё насельніцтва сканцэнтравана ў прыбярэжных раёнах, дзе шчыльнасць дасягае 1000 чал. на 1 км². У гарадах жыве больш за 70% насельніцтва. У прам-сці занята 19% эканамічна актыўнага насельніцтва, у сельскай гаспадарцы і рыбалоўстве — 8, у сферы паслуг — 73%. Значнае беспрацоўе (каля 35%), эміграцыя ў Францыю.

Гісторыя. Адкрыты ў пач. 16 ст. партуг. мараплаўцам П. ды Машкарэньяшам. З сярэдзіны 17 ст. каланізацыю вострава вялі французы, якія назвалі яго Бурбон. У 1810—15 востраў захапіла Вялікабрытанія. Пасля вяртання Францыі востраў атрымаў назву Р. (франц. «ўз'яднанне»). У 1946 Р. атрымаў статус «заморскага дэпартамента», у 1974 — унутр. аўтаномію, створаны Ген. і Рэгіянальны саветы, з 1982 паўнамоцтвы апошняга значна пашыраны.

Гаспадарка. Р. — с.-г. краіна з монакультурнай арыентацыяй. Штогадовы даход на 1 чал. каля 4,8 тыс. дол. (1998). Вытв-сць эл. энергіі 1,1 млрд. кВт·гадз (1996); каля 55% яе атрымліваюць на электрастанцыях, якія працуюць на імпартаваных нафтапрадуктах, каля 45% — на ГЭС. Гал. галіна прам-сці — перапрацоўка цукр. трыснягу (8 цукр. з-даў выпускаюць 222 тыс. т цукру, 1998).

Вадаспад у гарах на востраве **Рэюньён**.

Працуюць прадпрыемствы па вытв-сці рому, сокаў, ванілі, араматычных эсенцый, кансерваў (пладова-агародніннных і рыбных), алею, мясных вырабаў, мукі і хлебабулачных вырабаў, цыгарэт, буд. матэрыялаў. Часткова на экспарт працуюць швейныя, абутковыя, металаапр. і электронныя прадпрыемствы. Лясная прам-сць і дрэваапрацоўка. Развіты разнастайныя рамёствы і выраб сувеніраў. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 60 тыс. га зямель, у т.л. пад ворывам і шматгадовымі культурамі каля 50 тыс. га, пад пашай каля 10 тыс. га. Арашаецца 6 тыс. га. Ёсць буйныя плантацыі і дробныя сялянскія гаспадаркі. Асн. культура — цукр. трыснёг, займае каля 35 тыс. га, штогадовы збор 2—3 млн. т. Экспартнае значэнне мае вырошчванне ванілі і для парфумернай прам-сці Францыі эфіраносаў (пеларгонія, ветыверыя, іланг-іланг). Вырошчваюць таксама кукурузу, пшаніцу, бульбу, маніёк, агародніну, тытунь. У 1998 атрымана 17 тыс. т збожжа. Субтрапічнае садоўніцтва (манга, папайя, грэйпфрут, гуява і інш.). Вінаградарства. У горных раёнах развіта жывёлагадоўля. Пагалоўе (тыс. галоў, 1998): буйн. раг. жывёлы 26, авечак і коз 33, свіней 87. Рыбалоўства і промысел амараў. Важнае месца займае замежны турызм, на востраве развітая сетка інфраструктуры для турыстаў. У 1998 Р. наведала 370,3 тыс. чал., пераважна з Францыі. Унутр. транспарт аўтамабільны. На востраве 2,8 тыс. аўтадарог, у т.л. 2,2 тыс. км з цвёрдым пакрыццём. Асн. порт Ле-Пор. Каля г. Сен-Дэні міжнар. аэрапорт. У 1998 экспарт склаў 171,8 млн. дол., імпарт — 2,35 млрд. дол. У экспарце пераважаюць цукар (63%), ром і патака, парфумерныя эсенцыі, рыбапрадукты; у імпарце — машыны, паліва, харч. і спажывецкія тавары. Гал. гандл. партнёр — Францыя (74% экспарту, 67% імпарту), яна аказвае Р. пастаянную эканам. дапамогу. Грашовая адзінка — франц. франк.

І.Я.Афнагель (прырода, насельніцтва, гаспадарка).

РЭ́Я, у старажытнагрэчаскай міфалогіі стараж. багіня, тытаніда (гл. *Тытаны*), жонка і сястра тытана *Кронаса*. Лічылася дачкой *Урана* і *Геі*. Паводле міфаў, Р. нарадзіла Кронасу дачок і сыноў *Гестыю*, *Дэметру*, *Геру*, *Аіда*, *Пасейдона* і *Зеўса*. Кронас, які баяўся страціць уладу над светам, паядаў сваіх дзяцей. Р. шляхам падману выратавала і схавала ад яго Зеўса і Пасейдона. У перыяд позняй антычнасці Р. атаясамлівалі з фрыгійскай Вялікай маці багоў і называлі Р.-*Кібелай*.

РЭ́Я, спадарожнік планеты *Сатурн*. Дыяметр 1530 км, адлегласць ад Сатурна 527 тыс. км, сідэрычны перыяд абарачэння 4 сут 12 гадз 16 мін. Адкрыты ў 1672 Дж.Д.*Касіні*.



С, дзевятнаццатая літара бел. алфавіта. Паходзіць з кірыліцкай С («слова»), утворанай на аснове грэка-візант. устаўнай ϲ («сігма»). У старабел. графіцы ў сувязі з функцыянаваннем розных пісьмовых школ і выкарыстаннем розных тыпаў пісьма (*устаў*, *паўустаў*, *скорапіс*) ужывалася ў некалькіх варыянтах, якія памагаюць вызначаць час і месца напісання помнікаў. Абазначала гукі «с», «с'» («столъ», «сила»). У 16 ст., акрамя рукапіснай, набыла друкаваную форму. У сучаснай бел. мове абазначае шумныя глухія фрыкатыўныя пярэднеязычныя зычныя гукі «с», «с'» («сонца», «сяло», «сала»). Бывае вялікая і малая, мае рукапісную і друкаваную форму.

А.М.Булыка.

СА (скарачэнне ад ням. Sturmabteilungen, SA), гл. *Штурмавыя атрады*.

САВЕ́ДРА ЛА́МАС (Saavedra Lamas) Карлас (1.11.1878, Буэнас-Айрэс — 5.5.1959), аргенцінскі дзярж. дзеяч. Скончыў ун-т Буэнас-Айрэса (1903). Прафесар. З 1908 дэпутат парламента Аргенціны. З 1915 міністр юстыцыі і грамадз. адукацыі, у 1932—38 міністр замежных спраў. 3.8.1932 у сваёй міністэрскай дэкларацыі сфармуляваў прынцыпы міжнар. адносін, якія былі пакладзены ў аснову *Сааведра Ламаса пакта 1933*. У 1935 выконваў ролю пасрэдніка ў мірным урэгуляванні ўзбр. канфлікту паміж Парагваем і Балівіяй. У 1941—43 прэзідэнт ун-та Буэнас-Айрэса. Нобелеўская прэмія міру 1936.

САВЕ́ДРА ЛА́МАСА ПАКТ 1933, дагавор аб прынцыпах міжнар. адносін, заключаны па ініцыятыве міністра замежных спраў Аргенціны К.*Сааведра Ламаса*. Падпісаны 10 кастр. прадстаўнікамі Аргенціны, Бразіліі, Мексікі, Парагвая, Уругвая і Чылі, пазней большасцю дзяржаў Лац. Амерыкі і ЗША. Асуджаў агрэсіўныя войны, дэкларавaў урэгуляванне ўсіх міждзярж. спрэчак толькі мірнымі сродкамі. Забараняў узбр. ці інш. ўмяшанне ва ўнутр. справы адзін аднаго, прадугледжваў міжнар. ціск на дзяржавы-агрэсары. Абавязаў бакі не прызнаваць змены граніц, якія ажыццёўлены гвалтоўным шляхам.

САА́ДЗІ (сапр. Муслiх-ад-дзiн Абу Мухамед Абдалах iбн-Мушрыф iбн-Муслiх iбн-Мушрыф Саадзi Шыразi; паміж 1203 і 1210, г. Шыраз, Іран — 9.12.1292), персідскі пісьменнік, класік персідскай і таджыкскай літаратур. Пісаў і на араб. мове. Вучыўся ў Багдадзе. Вандраваў па краінах Блізкага і Сярэдняга Усходу. У 1256 вярнуўся ў Шыраз. С. лічаць пачынальнікам «чыстай» *газелі*. Яго газелі вылучаюцца прастатой і яснасцю вобразаў, натуральнасцю пачуццяў, даступнасцю мовы, музыкальнасцю, глыбокім зместам і вытанчанай маст. формаю. Найб. значныя творы — паэма «Бустан» (1257) і зб. прытчаў у прозе і вершах «Гулістан» (1258), якія ахопліваюць розныя бакі рэчаіснасці і кодэкса маралі, апяваюць душэўную прыгажосць чалавека. «Гулістан» — першы помнік перс. л-ры пра жыццё і побыт сярэдневяковага ўсх. горада. Многія афарызмы С. сталі нар. прымаўкамі. Асобныя яго вершы на бел. мову пераклаў С.Грахоўскі.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1972; Избранное. Ташкент, 1978; Гулистан. М., 1959; Бустан: Лирика. М., 1962; Бустан: [Поэма]. Душанбе, 1971.

Літ.: Алиев Р. Саади и его «Гулистан». М., 1958; Кулматов Н.А. Этические взгляды Саади. Душанбе, 1968.

САКА́ДЗЕ Георгій, Вялікі Маўраві (каля 1580, с. Пелі, Грузія — 13.10.1629), грузінскі дзярж. дзеяч і палкаводзец. Паходзіў з царскіх *азнауры*. У 1608—12 правіцель (маўраві) Тбілісі. У выніку феад. міжусобіц у 1612 уцёк у Іран. У 1620 шах Ірана *Абас I* прызначыў С. апекуном малалетняга цара васальнага *Картлійскага царства* Сімона II — фактычным правіцелем дзяржавы. У 1625 С. ўзначаліў антыіранскае паўстанне. Пасля паражэння ў Марабдзінскай бітве 1.7.1625 вёў партызанскую вайну, якая прымусіла шаха Ірана прызнаць царом Тэймураза I. Неўзабаве С. падняў мяцеж супраць Тэймураза I, але ў 1628 разбіты, уцёк у Турцыю, дзе быў забіты.

САА́МСКАЯ МО́ВА, лапарская мова, лапландская мова, адна з *фіна-угорскіх моў*, якая складае асобую галіну гэтай сям'і; мова саамаў. Блізкая да прыбалт.-фінскіх моў. Пашырана ў паўн. Нарвегіі, Швецыі, Фінляндыі, Расіі (на Кольскім п-ве). Мае 2 групы дыялектаў: зах. (на тэр. Нарвегіі, Швецыі, часткова Фінляндыі) і ўсх. (на тэр. Расіі і Фінляндыі). С.м. ўласцівы: у фанетыцы — розныя ступені працягласці галосных і зычных, вял. колькасць зычных фанем, сістэма чаргаванняў галосных па якасці, зычных па якасці і колькасці; у марфалогіі — наяўнасць у большасці дыялектаў парнага ліку; у сінтаксісе — адсутнасць дапасавання прыметнікаў-азначэнняў з назоўнікамі ў ліку і склоне.

Пісьменнасць С.м. Швецыі, Нарвегіі, Фінляндыі з 17 ст. на аснове лац. графікі; у Расіі з пач. 1930-х г. на аснове лац. графікі, пазней пераведзена на рус. графіку (існавала да 1937). У 1980-я г. пісьменнасць саамаў у Расіі адноўлена на аснове рус. графікі; створаны буквар і слоўнік для школ.

Літ.: Керт Г.М. Саамский язык: Фонетика, морфология, синтаксис. Л., 1971.

САА́Р, Саар (ням. Saar, франц. Sarre), рака ў Францыі і Германіі, правы прыток р. Мозель (бас. р. Рэйн). Даўж. 246 км, пл. басейна каля 7,4 тыс. км². Вытокі ў Вагезах. Павышаная воднасць зімой і вясной. У бас. С. — *Саарска-Латарынгскі каменнавугальны басейн*. Суднаходная, злучана з каналам Марна—Рэйн. На С. — гарады Саргемін (Францыя), Саарбрукен (Германія).

САА́Р, Саарская вобласць (Saarland, неафіц. — Saargebiet), зямля (адм. адзінка) на З Германіі, у басейнах рэк Саар і Мозель, каля граніцы з Францыяй і Люксембургам. Пл. 2570 км². Нас. каля 1,1 млн. чал. (2000). Адм. ц. — г. *Саарбрукен*. Рэльеф узгорысты і нізкагорны (выш. да 595 м). Клімат умераны, пераходны ад марскога да кантынентальнага. Т-ра паветра ў студз. каля 0 °С, у ліп. каля 19 °С. За год выпадае каля 700 мм ападкаў. Лясы (дуб, бук, граб) займаюць каля 30% плошчы. Гаспадарка мае індустр. характар. Здабыча кам. вугалю (*Саарска-Латарынгскі каменна-*

вугальны басейн). Прам-сць: чорная металургія, коксахімія, хім. (гумава-тэхн. вырабы, азотныя ўгнаенні), нафтаперапр., аўтамабілебуд., вагонабуд., эл.-тэхн., шкляная, керамічная, швейная, харчовая (асабліва мясаперапр.). Вырошчваюць збожжа, кармавыя культуры, агародніну. Садоўніцтва і вінаградарства. Жывёлагадоўля (буйн. раг. жывёла, свінні). Птушкагадоўля. Густая сетка чыгунак і аўтадарог. Суднаходства на рэках Мозель і Саар.

У сярэднія вякі на тэр. С. існавала графства, што ўваходзіла ў «Свяшчэнную Рым. імперыю». У 1790-я г. — 1814 уладанне Францыі. У 1815 большая ч. С. адышла да Прусіі, меншая — да Баварыі. У 1871—1918 у складзе Герм. імперыі. Паводле *Версальскага мірнага дагавора 1919* перададзены пад кіраванне Лігі Нацый на 15 гадоў (з 10.1.1920). У 1935 у выніку плебісцыту зноў адышоў да Германіі. У 1935—40 адміністрацыйна аб'яднаны з Пфальцам, у 1940—45 наз. Зах. марка. Пасля 2-й сусв. вайны з 2.1.1946 пад франц. кіраваннем (з 1945 у франц. акупац. зоне Германіі). Паводле Парыжскіх пагадненняў 1954 (Саарскі статут) часова знаходзіўся пад кантролем *Заходнееўрапейскага саюза*. Пасля адхілення Саарскага статута на плебісцыце 23.10.1955 паводле пагаднення аб С. паміж ФРГ і Францыяй (1956) канчаткова ўключаны ў склад ФРГ і стаў адной з яе зямель (з 1.1.1957).

САА́РБРУ́КЕН (Saarbrücken), горад на З. Германіі, на р. Саар. Адм. ц. зямлі Саар. Вядомы з 999. Каля 250 тыс. ж. (2001). Трансп. вузел міжнар. значэння (чыгункі, аўтадарогі). Порт на р. Саар. Аэрапорт. Цэнтр *Саарска-Латарынгскага каменнавугальнага басейна*. Прам-сць: чорная металургія, агульнае і трансп. машынабудаванне, эл.-тэхн., хім., паліграф., харч. і харчасмакавая, лёгкая. Ун-т. Кансерваторыя.

САА́РСКА-ЛАТАРЫ́НГСКІ КАМЕННАВУ́ГАЛЬНЫ БАСЕ́ЙН. На мяжы Францыі (Латарынгія) і Германіі (Саар). Адзін з буйнейшых у Зах. Еўропе. Эксплуатуецца з пач. 19 ст. Пл. каля 7 тыс. км^2. Верагодныя запасы да глыб. 1200 м каля 3 млрд. т. Вугляносныя адклады верхняга карбону. Вуглі каксавальныя і газавыя. Цеплыня згарання 31,5—35,7 МДж/кг. Гал. цэнтры здабычы: Саарбрукен, Фёльклінген, Нойнкірхен (Германія), Фарбак, Мерлебак, Пціт—Расель (Францыя).

СА́АРЫНЕНЫ (Saarinen), сям'я архітэктараў. Нарадзіліся ў Фінляндыі. Э л і э л ь С. (20.8.1873, г. Рантасалмі — 30.6.1950), фінскі архітэктар, пачынальнік нац. рамантызму ў фін. архітэктуры. У 1893—97 вучыўся ва ун-це і політэхн. ін-це ў Хельсінкі. З 1923 працаваў у ЗША. Зазнаў уплыў амер., англ. і ням. архітэктуры канца 19 ст. Супрацоўнічаў з арх. А.Ліндгрэнам і Г.Гезеліусам (сумесныя пабудовы — фін. павільён на

Сусв. выстаўцы ў Парыжы, 1900; Нац. музей у Хельсінкі, 1906—09). Звяртаўся да традыцый фін. нар. дойлідства, выкарыстоўваў мясц. буд. матэрыялы (дрэва, граніт), урачысты, геам. арнаментальны дэкор, імкнуўся да рацыянальнай арг-цыі прасторы (цэнтр. вакзал у Хельсінкі, 1904—14). Стварыў праект «Вял. Хельсінкі» (1915—18, не ажыццёўлены), засн. на прынцыпах дэцэнтралізацыі гар. структуры, імкненні да адзінства архітэктуры і ландшафту, што паўплывала на горадабудаўніцтва 20 ст. Э р а С. (20.8.1910, г. Кіркенумі — 1.7.1961), амер. архітэктар. Сын Эліэля С. З 1923 жыў у ЗША; працаваў з бацькам. Вучыўся ў арх. школе Іельскага ун-та ў Нью-Хейвене (1934). Пасля смерці бацькі здзейсніў іх сумесны праект Тэхн. цэнтра кампаніі «Джэнерал моторс» у Уорэне (штат Мічыган; 1945—55). Зазнаў уплыў Л.*Міс ван дэр Роэ*. Ад рацыяналізму і неакласіцызму 1950-х г. перайшоў да *арганічнай архітэктуры*, пазней наблізіўся да *бруталізму*. Для творчасці С. характэрны пошукі сімвалічнай выразнасці арх. форм, пластычнасці, рамант. экспрэсіі (капэла Масачусецкага тэхнал. ін-та ў Кеймбрыджы, ЗША, 1953—56, аэравакзал кампаніі TWA у аэрапорце Кенэдзі ў Нью-Йорку, 1962, будынак аэравакзала імя Далеса каля Вашынгтона, 1962).

Да арт. **Саарынены**. Эра С а а р ы н е н. Аэравакзал імя Далеса каля Вашынгтона.

САА́РЫШ (Soares) Марыу (н. 7.12.1934, Лісабон), партугальскі паліт. і дзярж. дзеяч. Адвакат. Скончыў Лісабонскі ун-т. З канца 1940-х г. удзельнік руху супраць дыктатуры А.Салазара. У 1970—74 у эміграцыі ў Францыі, дзе ў 1973 заснаваў партуг. Сацыяліст. партыю (у 1973—86 яе ген. сакратар). Пасля Партуг. рэвалюцыі 1974 міністр замежных спраў (1974—75), выступаў за наданне незалежнасці афр. калоніям Партугаліі. У 1976—78 і 1983—85 прэм'ер-міністр, у 1986—96 прэзідэнт Партугаліі.

САА́РЭМАА (Saaremaa), Э з е л ь, самы буйны в-аў Маанзундскага (Зах.-Эстонскага) архіпелага ў Эстоніі, у Балтыйскім м. Пл. 2,7 тыс. км^2. Злучаны дамбай з в-вам Муху. Складзены гал. ч. з вапнякоў, месцамі ўкрыты ледавіковымі і марскімі адкладамі. Паверхня нізінная (выш. да 50 м), месцамі забалочаная. Радовішчы даламітаў і вапнякоў. Рэдкія зараснікі ядлоўцу, хваёвыя лясы. Рыбалоўства. На в-ве Війдумяэскі і Вілсандыйскі запаведнікі; геал. заказнік Каалі (метэарытныя кратэры). Гал. горад — Курэссаарэ.

САА́ЎТАРСТВА, сумеснае аўтарства двух і болей асоб на адзін твор, які з'яўляецца аб'ектам аўтарскага права. У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах» ад 16.5.1996, аўтарскае права на твор сумеснай працы належыць сааўтарам

Да арт. **Саарынены**. Эліэль С а а р ы н е н. Цэнтральны вакзал у Хельсінкі.

сумесна незалежна ад таго, утварае твор непарыўнае цэлае ці складаецца з частак, кожная з якіх мае самаст. значэнне. Прызнаецца, што частка твора мае самаст. значэнне, калі яна можа выкарыстоўвацца незалежна ад інш. частак твора. Кожны з сааўтараў правамоцны выкарыстоўваць створаную ім частку твора, якая мае самаст. значэнне, паводле свайго меркавання, калі інш. не прадугледжана пагадненнем паміж імі. Права на выкарыстанне твора ў цэлым належыць сааўтарам сумесна. Іх узаемаадносіны вызначаюцца пагадненнем паміж імі. Калі твор з'яўляецца адзіным непарыўным цэлым, то ні адзін з сааўтараў не мае права без дастатковых падстаў забараніць яго выкарыстанне.

Г.А.Маслыка.

САБАДЭ́ЛЬ (Sabadell), горад на ПнУ Іспаніі, у аўт. вобл. Каталонія, прамысл. спадарожнік г. Барселона. Каля 200 тыс. ж. (2000). Трансп. вузел. Аэрапорт. Буйны цэнтр тэкст. прам-сці; тэкст. машынабудаванне, вытв-сць эл. абсталявання, прыладабудаванне.

САБА́КА СВО́ЙСКІ (Canus fimiliarus), млекакормячая жывёла сям. сабачых. Паходзіць ад воўка, прыручаны каля 10 тыс. гадоў да н.э. Вядома каля 400 сучасных парод, якія адрозніваюцца памерамі, экстэр'ерам, паводзінамі. Падзяляюцца на 3 асн. групы: *дэкаратыўна-пакаёвыя сабакі, паляўнічыя сабакі, службовыя сабакі.*

Тыповыя драпежнікі. Маюць 42 зубы (12 разцоў, 4 клыкі, 26 карэнных), з іх найб. развіты клыкі. Канечнасці пальцаходныя; на пярэдніх лапах па 5 пальцаў (адзін не кранаецца зямлі), на задніх па 4. Развіты слых, зрок, нюх. Добра бегаюць, скачуць, плаваюць. Мозг развіты. Дрэсіруюцца з разнастайнымі мэтамі. Палавой спеласці самкі дасягаюць у 7—8, самцы ў 10—12 мес. Цяжарнасць 58—65 сут. Нараджаюць 1—18 сляпых, глухіх, без зубоў шчанят. Жывуць 10—12 гадоў. Гл. таксама *Сабакагадоўля.*

САБАКАГАДО́ЎЛЯ, развядзенне *сабак свойскіх* культурных парод. Вылучаюць С. службовую (для вартаўнічай, пагранічнай, ездавой, пастухоўскай і інш. службаў), паляўнічую (спарт. і прамысл. паляванне), дэкаратыўна-пакаёвую. Тэарэт. аснова С. — *кіналогія.*

Пры селекцыйнай рабоце сабак ацэньваюць і адбіраюць па канстытуцыі, экстэр'еры, рабочых і псіхічных якасцях і інш. Службовых і паляўнічых сабак гадуюць у спец. гаспадарках, а таксама сабакаводы-аматары. Утрыманне сабак у гарадах і пасёлках гар. тыпу рэгламентуецца абавязковай рэгістрацыяй, правіламі ўтрымання ў жылых памяшканнях і выгулу, тэрмінамі прышчэпак і інш. Праводзяцца выстаўкі сабак.

САБАЛЕ́НКА Раман Карпавіч (15.10.1907, в. Сабалі Брагінскага р-на Гомельскай вобл. — 13.5.1975), бел. пісьменнік. Скончыў Гомельскі пед. тэхнікум (1929), вучыўся ў Гомельскім пед. ін-це (1933—35). Працаваў у рэдакцыях газет, час. «Маладосць», у 1957—66 нам. гал. рэдактара газ. «Літаратура і мастацтва». Друкаваўся з 1928. Аўтар паэмы «Брагінь» (1935); зб-каў вершаў «З родных крыніц» (1950), «Мая эстафета» (1954); кніг прозы «Жменя зярнят» (1957), «Сустрэчы» (1958), «Блакітнае ззянне» (1959), «Каралінцы» (1960), «З пройдзеных дарог» і «Паляўнічыя боты» (гумарыст. апавяданні, абедзве 1962), «Незамужняя ўдава» (1965), «Пад дажджом і сонцам» (1966), «Спатканне пасля разлукі» (1971), «Роздум у дарозе» (1973); кнігі нарысаў пра дзеячаў бел. л-ры і культуры «Колерамі вясёлкі» (1975). Аповесці «Юнацтва ў дарозе» (1956—60), «Выпрабаванне сталасці» («Іду ў жыццё», 1961), «Былое застаецца ў сэрцы» (1963) склалі трылогію «Іду ў жыццё» (1968). У творах паказваў людзей працавітых, адданых сваёй справе, сумленных, шчырых, выкрываў вытокі бездухоўнасці, мяшчанства. Лепшыя творы адметныя складанасцю псіхал. канфліктаў, прасякнуты высокім маральным пафасам. Іх мова сакавітая, нар., насычаная спецыфічнай дыялектнай ці прафес. лексікай

Тв.: Выбр. творы. Т. 1—2. Мн., 1967—68; Выбранае. Мн., 1977; Творы. Т. 1—2. Мн., 1983.

Літ.: Карпаў У. Раман Сабаленка // Полымя. 1963. № 7; Александровіч С. Згадваючы далёкае і блізкае // Там жа. 1967. № 10; Шамякіна Т. След у літаратуры // Там жа. 1977. № 10. *Г.С.Шупенька.*

САБАЛЕ́НКА Эла Раманаўна (н. 26.9.1936, г. Гомель), бел. этнограф. Дачка Р.К.*Сабаленкі.* Канд. гіст. н. (1967). Скончыла БДУ (1959). З 1960 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі, у 1977—2000 выкладала ў Бел. ун-це культуры ў Мінску. Аўтар манаграфіі «Этнаграфічная спадчына Якуба Коласа» (1969), раздзела «Беларусы» («Этнаграфія ўсходніх славян», 1987), раздзелаў у калект. манаграфіях «Беларускае народнае жыллё» (1973), «Змены ў побыце і культуры сельскага насельніцтва Беларусі» (1976), «Этнічныя працэсы і лад жыцця» (1980), адзін з аўтараў раздзела «Беларусь» у кн. «Краіны і народы» (М., 1984). *Л.А.Суднік.*

САБАЛЕ́ЎСКІ Аляксандр Аляксандравіч (н. 11.12.1942, г. Жодзіна Мінскай вобл.), бел. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1991). Скончыў БПІ (1968). Працаваў у ін-тах «Белдзяржпраект», «Мінскпраект». З 1977 гал. архітэктар праектаў ін-та «Белдзяржпраект», адначасова кіраўнік персанальнай творчай майстэрні. Асн. работы: у Мінску — будынкі ін-таў «Белдзіпрадор» і «Дзіпрасувязі» (1973—76), райвыканкома Партызанскага р-на (1978—80), эксперым. школа на 40 класаў з плавальным басейнам у мікрараёне Усход 1 (1978), забудова мікрараёна Сярова 1 (1977—82), вучэбна-лабараторны корпус інж.-фіз. факультэта БПІ (1985—90), гал. вучэбна-лабараторны корпус універсітэцкага гарадка і студэнцкі інтэрнат для замежных студэнтаў пры БДУ (1991—97); жылыя дамы ў г. Бабруйск Магілёўскай вобл. (1998); аўтасэрвісны цэнтр у р-не Бараўлян (Мінскі р-н; 2000—01); у Расіі — жылыя мікрараёны, грамадскія будынкі ў г. Лангепас Цюменскай вобл. (1982—98), жылы пасёлак Сіпягіна Падольскага р-на Маскоўскай вобл. (1995—2000), спарт. комплекс у г. Цюмень (1998, усе ў сааўт.).

Р.К.**Сабаленка**.

А.П.**Сабалеўскі**.

САБАЛЕ́ЎСКІ Аляксандр Пятровіч (30.8.1905, г. Гарадок Віцебскай вобл. — 12.1.1988), Герой Сав. Саюза (1940). Скончыў Ваенна-мед. акадэмію (1945). У Чырв. Арміі з 1926. Са жн. 1937 карабельны ўрач на ледаколе «Георгій Сядоў»; у жн. 1937 — студз. 1940 у час 812-дзённага дрэйфу ледакола ў Паўн. Ледавітым акіяне дзякуючы намаганням С. члены экіпажа не захварэлі на цынгу і вытрымалі маразы, ён таксама актыўна ўдзельнічаў ва ўсіх работах на ледаколе і льдзіне. У Вял. Айч. вайну ў ліп.—вер. 1941 удзельнік баёў на Ленінградскім фронце. Да 1959 на ваенна-мед. службе.

САБАЛЕ́ЎСКІ Аляксей Іванавіч (7.1.1857, Масква — 24.5.1929), рускі і ўкраінскі філолаг, мовазнавец-славіст, палеограф і педагог. Акад. Пецярбургскай АН (1900; чл.-кар. 1893). Скончыў Маскоўскі ун-т (1878). Праф. Кіеўскага і Пецярбургскага ун-таў. Даследаваў праблемы параўнальна-гіст., слав. і рус. мовазнаўства, стараж. слав. пісьменнасці і палеаграфіі. Адзін з заснавальнікаў гіст. дыялекталогіі рус., бел. і ўкр. моў. Аўтар прац «Лекцыі па гісторыі рускай мовы» (1888), «Спроба рускай дыялекталогіі. Гаворкі велікарускія і беларускія» (1897), «Матэрыялы і даследаванні ў галіне славянскай філалогіі і археалогіі» (1910) і інш. Пры вывучэнні гіст. граматыкі, фанетыкі і лексікалогіі рус. мовы шырока выкарыстоўваў матэрыялы старабел. і стараўкр. пісьмовых помнікаў і нар. гаворак. Даследаваў пытанні этнаграфіі, гісторыі стараж. мастацтва і фальклору. Выдаў «Велікарускія народныя песні» (т. 1—7, 1895—1902).

Літ.: Булахов М.Г. Восточнославянские языковеды. Мн., 1978. Т. 3. С. 200—215. *Г.К.Цівanова.*

САБАЛЕ́ЎСКІ Анатоль Вікенцьевіч (н. 27.5.1932, в. Андрыеўшчына Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.), бел. тэатразнавец, крытык, педагог. Д-р мастацтвазнаўства (1974), праф. (1975). Ганаровы д-р навук Ташкенцкага ін-та мас-

тацтваў імя М.Уйгура (1998). Скончыў БДУ (1958). З 1958 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі (у 1990—93 заг. аддзела міжнар. культ. працэсаў). З 1961 выкладае ў Бел. АМ (у 1972—90 заг. кафедры, у 1984—89 рэктар), з 1993 у Бел. ун-це культуры (у 1993—2000 заг. кафедры), адначасова ў 1992—98 гал. рэдактар час. «Тэатральная Беларусь» («Тэатральная творчасць»). Даследуе пытанні гісторыі тэорыі і сучаснай практыкі бел. тэатра, драматургіі, узаемасувязей бел. тэатр. мастацтва з культурамі інш. народаў, творчасць дзеячаў сцэны. Укладальнік, рэдактар тэкстаў, аўтар уступных артыкулаў і каментарыяў да кн. «Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі» (т. 1—2, 1975; 2-е выд. т. 1—3, 1997—2000), аўтар раздзелаў да кн. «Гісторыя беларускага тэатра» (т. 1, 1983); складальнік, рэдактар і аўтар артыкулаў да кн. «Культура беларускага замежжа» (кн. 1—3, 1993—98), рэдактар і аўтар уступных артыкулаў у кн. «Беларуская драматургія» (кн. 1—4, 1994—97), аўтар раздзела «Беларускі тэатр» у кн. «Савецкае акцёрскае мастацтва, 50—70-я гг.» (1982), аповесці «Жылі-былі хлопцы...» (1961), апавяданняў.

Тв.: Рампай асветленае: Тэатральна-крытыч. арт. Мн., 1962; Уладар дум чалавечых: Творчасць нар. артыста СССР Барыса Платонава. Мн., 1964; Ад п'есы — да спектакля. Мн., 1965; Беларуская савецкая драма. Кн. 1—2. Мн., 1969—72; Театр открывает занавес. Мн., 1970; Белорусская драматургия в театрах народов СССР. Мн., 1972; Жыццё тэатра: Мастацтвазнаўчыя арт., рэцэнзіі. Мн., 1980; Белорусско-молдавские театральные связи. Мн., 1984; Сучаснасць і гісторыя: Крытыч. арт. Мн., 1985; Барыс Платонаў: Жыццё і творчасць вялікага бел. артыста. 2 выд. Мн., 1989; Кандрат Крапіва: Нарыс жыцця і творчасці. Мн., 1989; Асоба мастака: Літ.-крытыч. арт. Мн., 1992; Глеб Глебаў: Жыццё і творчасць вялікага бел. камедыйнага акцёра. Мн., 1994. *Т.Я.Гаробчанка.*

САБАЛЕ́ЎСКІ Дзмітрый Юр'евіч (н. 8.8.1959, Мінск), бел. вучоны ў галіне механікі грунтоў і геатэхнікі. Д-р тэхн. н., праф. (1999). Сын Ю.А.*Сабалеўскага*. Скончыў БПІ (1981). З 1981 у БПА (у 1993—95 заг. кафедры). Адначасова з 1993 ген. дырэктар кампаніі «ЭкоТэхІнвест». Навук. працы па праблемах дылатансіі ў механіцы грунтоў і зярністых асяроддзяў, тэорыі трываласці дылацыруючых дысперсных асяроддзяў, праблемах спец. фундаментабудавання, падземнага буд-ва і экалагічнай геатэхнікі.

Тв.: Прочность и несущая способность дилатирующего грунта. Мн., 1994; Strength of dilating soil and load-holding capacity of deep foundations. Rotterdam, 1995.

САБАЛЕ́ЎСКІ Юрый Аляксандравіч (н. 29.9.1923, Мінск), бел. вучоны ў галіне будаўніцтва. Д-р тэхн. н., праф. (1970). Засл. будаўнік Беларусі (1980). Бацька Дз.Ю.*Сабалеўскага*. Скончыў БПІ (1950), дзе і працаваў (у 1965—93 заг. кафедры). Навук. працы па механіцы грунтоў і фундаментабудаванні, праблемах устойлівасці фільтруючых адхонаў, апоўзняў і воданасычаных асноў, будаўніцтву падземных збудаванняў. Прапанаваў метады вызначэння канчатковых гарыз. зрушэнняў падмуркаў гідратэхн. збудаванняў, праектавання і канструявання бурaін'екцыйных анкераў і паляў. Удзельнічаў у праектаванні Мінскага метрапалітэна. Прэмія СМ СССР 1989.

Тв.: Криволинейные очертания однородных откосов. Мн., 1969; Водонасыщенные откосы и основания. Мн., 1975; Механика грунтов. Мн., 1986.

А.В.**Сабалеўскі**.

П.**Сабацье**.

САБАЛЁЎКА, вёска ў Родненскім с/с Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр птушкафабрыкі «Клімавіцкая». За 25 км на У ад горада і чыг. ст. Клімавічы, 149 км ад Магілёва. 310 ж., 102 двары (2001). Клуб, б-ка.

САБАЛЬШЧЫКО́Ў-САМА́РЫН (сапр. Сабальшчыкоў) Мікалай Іванавіч (9.4.1868, С.-Пецярбург — 20.7.1945), расійскі рэжысёр, акцёр. Нар. арт. Расіі (1934). З 1892 акцёр, рэжысёр, перыядычна і антрэпрэнёр тэатраў, пераважна прыволжскіх гарадоў. Садзейнічаў стварэнню высокамаст. акцёрскіх ансамбляў, быў прапагандыстам драматургіі А.Чэхава і М.Горкага. З 1917 працаваў у Адэсе, з 1924 маст. кіраўнік, акцёр і рэжысёр т-ра ў Ніжнім Ноўгарадзе. Сярод пастановак: «Мяшчане» М.Горкага (1927, 1-я пастаноўка 1903), «Гора ад розуму» А.Грыбаедава, «Гамлет» У.Шэкспіра, «Страх» А.Афінагенава (усе 1932), «Байцы» Б.Рамашова (1934) і інш. Сярод лепшых роляў: Акцёр і Сацін, Бяссеменаў і Цяцераў («На дне», «Мяшчане» М.Горкага), Нязнамаў («Без віны вінаватыя» А.Астроўскага), Рагожын («Ідыёт» паводле Ф.Дастаеўскага).

САБАНТУ́Й (ад тат. літар. — свята плуга), старажытнае веснавое земляробчае свята даісламскага паходжання ў татараў (казанскіх, сібірскіх і інш.) і башкіраў. Традыцыйна адзначаўся да пач. веснавой сяўбы вёскамі адной акругі пачаргова без дакладнай даты ў залежнасці ад прыродных умоў. Уключаў частаванне прыгатаванай на лузе ў катлах абрадавай кашай, наведванне могілак, спарт. спаборніцтвы (бег, скачкі вярхом, нац. барацьбу — керэш і інш.), дзіцячыя і юнацкія забавы. З 20 ст. праводзіцца паўсюдна пасля завяршэння палявых работ як нац. свята. У 1990-я г. адроджана святкаванне С. ў бел. татараў Акрамя татараў і башкіраў С. адзначаюць некат. групы народаў, якія жывуць па суседстве з імі, — марыйцаў, рускіх, удмуртаў, чувашоў.

САБАЦІ́НАЎКА, сяло на левым беразе р. Паўд. Буг, ва Ульянаўскім р-не Кіраваградскай вобл. (Украіна), каля якога знаходзяцца рэшткі двух паселішчаў *трыпольскай культуры* (2-я пал. 4-га тыс. да н.э.). Даследаваліся ў 1930—40-я г. Выяўлены рэшткі наземных пабудоў і глінабітных дамоў, антрапаморфныя статуэткі, разнастайная кераміка (частка з размалёўкай), прылады з каменю, косці, рогу, медныя і касцяныя вырабы і інш. У верхнім слоі 1-га паселішча знойдзены матэрыялы позняга этапу *зрубнай культуры* (т.зв. сабацінаўскага).

САБАЦЬЕ́ (Sabatier) Поль (5.11.1854, г. Каркасон, Францыя — 14.8.1941), французскі хімік-арганік, адзін з заснавальнікаў арган. каталізу. Чл. Парыжскай АН (1913). Скончыў Вышэйшы пед. ін-т у Тулузе (1877). У 1882—1930 у Тулузскім ун-це (з 1884 праф.). Навук. працы пераважна па каталізе. Прапанаваў выкарыстоўваць замест высакародных металаў у якасці каталізатараў нікель, медзь, кобальт, жалеза. Адкрыў метады каталітычнага гідрыравання арган. злучэнняў з выкарыстаннем у якасці каталізатараў дробнадысперсных металаў. Увёў у практыку каталізу носьбіты каталізатараў (дробнадысперсных металаў) для павышэння іх устойлівасці. Нобелеўская прэмія 1912.

Тв.: Рус. пер. — Катализ в органической химии. Л., 1932.

САБА́ЧЫЯ, воўчыя, псовыя (Canidae), сямейства млекакормячых атр. драпежных. 15 (12) родаў, 35 (29) відаў. Пашыраны паўсюдна, акрамя Антарктыды і некат. астравоў (Мадагаскар, Новая Зеландыя, Сулавесі, Тайвань, арх. Меланезія і Палінезія). Жывуць у разнастайных, пераважна адкрытых ландшафтах. Селяцца ў норах або логавах. Трымаюцца паасобна, часам парамі, некат. — сямейнымі групамі і зграямі. На Беларусі пашыраны *воўк*, *ліс*, *янотападобны сабака*.

Даўж. да 160 см, маса да 80 кг. Афарбоўка разнастайная, пераважна аднатонная. Галава падоўжаная, морда вострая, вушы стаячыя. Футра густое, звычайна пушыстае. Хвост доўгі. На пярэдніх лапах па 5 пальцаў (у гіенавага сабакі — 4), на задніх — па 4; кіпцюры тупыя, не ўцягваюцца. Драпежнікі, спажываюць і расл. корм. Манагамы. Нараджаюць 3—4 (зрэдку да 13—16) шчанят 1 раз на год. Многія С. — аб'екты промыслу і зверагадоўлі (ліс, *пясец* і інш.). Да С. адносяцца ўсе пароды *сабак свойскіх*. *А.М.Петрыкаў.*

САБА́ШНІКАЎ Ананій Васілевіч (н. 7.11.1917, г. Вязнікі Уладзімірскай вобл., Расія), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Маскоўскае Ваенна-паліт. вучылішча (1942), курсы падрыхтоўкі камандзіраў стралк. рот (1943). У Вял. Айч. вайну на фронце з 1942. Камандзір

роты ст. лейтэнант С. вызначыўся 22—24.6.1944 у баях на Віцебшчыне, дзе каля в. Арэхі Шумілінскага р-на прарваў з байцамі абарону праціўніка, каля в. Мамойкі Бешанковіцкага р-на першы фарсіраваў Зах. Дзвіну і захапіў плацдарм. Да 1987 на парт. і гасп. рабоце.

САБЕ́ЙСКАЕ ЦА́РСТВА, С а б а, старажытная дзяржава плем. саюза сабеяў у Паўд. Аравіі (частка тэр. сучаснага Емена) у 8 ст. да н.э. — пач. 4 ст. н.э. Рэзідэнцыяй правіцеляў (мукарыбаў і цароў) С.ц. быў г. Марыб. Паводле сведчанняў ант. аўтараў, царства адыгрывала важную ролю як гандл. пасрэднік паміж Індыяй, дзяржавамі ўсх. ўзбярэжжа Афрыкі і стараж. краінамі Міжземнамор'я. З сярэдзіны 1-га тыс. да н.э. значная частка С.ц. заваявана *Хім'ярыцкім царствам*. У канцы 2 ст. н.э. аб'яднаныя сілы С.ц., Аксума і Хадрамаўта разбілі армію хім'ярытаў і падпарадкавалі іх дзяржаву. З пач. 4 ст. тэр. царства ўвайшла ў склад Хім'ярыцкай дзяржавы.

САБЕКО́ШТ, грашовае выражэнне бягучых затрат на вытв-сць і рэалізацыю прадукцыі; частка *вартасці*. Уключае кошт выдаткаваных у вытв-сці прадметаў працы (сыравіны, матэрыялаў, паліва, энергіі); кошт *сродкаў працы* (збудаванняў, машын, абсталявання), перанесеных у працэсе вытв-сці на навастворaны прадукт; аплату працы работнікаў; расходы па збыце і рэалізацыі прадукцыі і інш. выдаткі прадпрыемства па арганізацыі вытв-сці і кіраванні. Адрозніваюць С. базісны, індывід., перавозак, прадукцыі, тэхнал., вытв. і фактычны (справаздачны). С. б а з і с н ы — С. мінулага перыяду, які бярэцца за аснову разліку С. бягучага або планавага перыяду; С. і н д ы в і д у а л ь н ы — затраты на выраб канкрэтнага віду прадукцыі; С. п е р а в о з а к — затраты на транспартаванне грузаў (прадукцыі) на розных відах транспарту; С. п р а д у к ц ы і — затраты прадпрыемства (аб'яднання, арганізацыі) на выраб і рэалізацыю прадукцыі (паслуг); С. т э х н а л а г і ч н ы — затраты на арганізаванне тэхнал. працэсу вытв-сці прадукцыі і аказання паслуг; С. в ы т в о р ч ы — затраты прадпрыемства на вытв-сць прадукцыі, у якія ўключаюцца кошт паўфабрыкатаў, купленых вырабаў і паслуг інш. прадпрыемстваў, а таксама затраты на абслугоўванне і кіраванне прадпрыемствам; С. ф а к т ы ч н ы (справаздачны) вызначаецца на аснове фактычных затрат па ўсіх пунктах С. за дадзены перыяд. Выкарыстоўваецца ў гасп. разліку для ацэнкі эфектыўнасці работы прадпрыемства і яго структурных падраздзяленняў, таксама для ўстанаўлення і змянення цэн на прадукцыю (паслугі). *У.Р.Залатагораў.*

САБЕ́СКІ (Sobieski) Ян (1629—96), вялікі князь ВКЛ і кароль Рэчы Паспалітай (з 1674); гл. *Ян III Сабескі*.

САБІ́ЛА Іван Іванавіч (н. 22.4.1940, Мінск), рускі пісьменнік. Правадз. чл. Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў (1995). Чл.-кар. Акадэміі рас. славеснасці (1997). Скончыў Ін-т фізічнай культуры імя П.Лесгафта (1967). Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Расіі (з 1994). Старшыня праўлення Санкт-Пецярбургскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Расіі (з 1993). Друкуецца з 1964. Першая кніга — «Абуджэнне» (1977). У кн. «Паказальны бой» (1980), «Усе дні развітання» (1984), «Апошнія канікулы» (1988), складаны свет падлеткаў, праблемы нефармальнага лідэрства.

І.І.**Сабіла**.

Жыццё паслываен. Мінска ў аповесці «Таварная станцыя» (1995). Аповесць «Застаюся ў заслоне» (1982) пра юнага партызана Вял. Айч. вайны Сашу Барадуліна. У кн. «Прысуд» (1997) артыкулы і мемуарны нарыс пра С.Даўлатава. Перакладае на рус. мову вершы С.Законнікава, В.Зуёнка, А.Пісьмянкова. Некат. творы С. экранізаваны і інсцэніраваны. Заснавальнік і гал. рэдактар газ. «Литературный Петербург» (1998).

Тв.: Пострадавших не будет. Л., 1987; Открытый ринг. СПб., 2000.

САБІ́НА (Sabina) Карал (29.12.1813, Прага — 9.11.1877), дзеяч чэш. нац.-вызв. і рэв. руху, літаратар. Вучыўся ў Пражскім і Венскім ун-тах. Адзін з арганізатараў тайнага радыкальнага гуртка «Чэшскі рыпіл» (1844, на ўзор ірл. Асацыяцыі *рыпілераў*). У час Рэвалюцыі 1848—49 у Чэхіі лідэр радыкальных дэмакратаў, рэдактар шэрагу іх газет і часопісаў, член Сватавацлаўскага к-та, яго ваен. арг-цыі «Сворнасць» і паліт. саюза «Слав. ліпа». У 1849 арыштаваны, прыгавораны да пакарання смерцю (заменена на 18 гадоў зняволення), у 1857 амністыраваны. У 1859—72 быў інфарматарам аўстр. паліцыі. Аўтар літ.-крытычных і літ.-тэарэт. твораў, рамантычных апавяданняў і раманаў сац. зместу, лібрэта оперы Б.Сметаны «Прададзеная нявеста».

САБІ́НЫ (Sabini), старажытнаіталійскія плямёны (гл. *Італікі*) умбра-оскска-сабе́льскай галіны. Рассяляліся паміж рэкамі Тыбр, Атэрнус і Аніо. Асн. занятак — земляробства і жывёлагадоўля. Сучасныя гісторыкі лічаць, што С. адыгралі вял. ролю ва ўтварэнні рым. народнасці. У 5—4 ст. да н.э. частка С., якая не ўвайшла ў склад Рым. дзяржавы, вяла барацьбу супраць Рыма і завяваана ім у 290 да н.э. У 268 да н.э. С. атрымалі рым. грамадзянства (без права голасу).

САБО́Р, 1) афіцыйны сход епіскапаў і інш. прадстаўнікоў хрысц. цэркваў, які склікаецца з мэтай распрацоўкі пала-жэнняў веравучэння, богаслужэння, дысцыплінарных норм і мер барацьбы з ерасямі. Па традыцыі першым С. лічыцца сустрэча апосталаў у Іерусаліме. Бываюць памесныя, на якіх збіраюцца іерархі асобных краін ці рэгіёнаў, і *ўся-*

Рана страцілі сваю мову, раманізаваны. На тэр., дзе жылі С., знаходзіўся Сабунім, маёнтак *Гарацыя*. Стараж. паданне пра выкраданне сабінянак атрымала распаўсюджанне ў творах мастацтва. *А.Г.Зельскі.*

САБЛЕР Ягор Ягоравіч (12.5.1810, Эстонія — 16.12.1865), расійскі астраном і геадэзіст; адзін з пачынальнікаў астрафіз. даследаванняў. Д-р філасофіі (1839). Скончыў Дэрпцкі (Тартускі) ун-т. З 1839 у Пулкаўскай астр. абсерваторыі, з 1854 дырэктар Віленскай астр. абсерваторыі. У 1843—55 удзельнічаў у астранома-геад. вымярэннях у Фінляндыі і паўн.-зах. губернях Расіі. Навук. працы па назіральнай астраноміі, вышэйшай геадэзіі, складанні зорных каталогаў і ўдакладненні фігуры Зямлі. Адзін з першых у Расіі арганізаваў сістэм. даследаванні паверхні Сонца і Месяца фатагр. метадам (з 1854).

Літ.: Новокшанова-Соколовская З.К. Картографические и геодезические работы в России в XIX — начале XX в. М., 1967. *А.І.Болсун.*

САБО́ (франц. sabot), 1) чаравікі на драўлянай падэшве (на Беларусі наз. *дзеравяшкі*) або выдзеўбаныя з дрэва (клумпы), а таксама абутак, які нагадвае такія чаравікі. 2) Прыстасаванне для блакіроўкі колаў машын.

Да арт. **Сабор**. П.Жарай. Сабор Новапакутнікаў Мінскай епархіі.

ленскія саборы. У каталіцызме памесны С. наз. *сінодам*. 2) Гал. храм горада ці манастыра, дзе богаслужэнне праводзіць вышэйшая асоба (патрыярх, архіепіскап і інш.), таксама храм, прызначаны для сумеснага богаслужэння духавенствам з некалькіх цэркваў. Саборны храм у епархіяльным горадзе наз. кафедральным. Архітэктура С. звычайна вызначаецца манументальнасцю форм, адлюстроўвае асн. тэндэнцыі пануючага арх. стылю. Сярод найб. яскравых узораў саборнай архітэктуры: *Канстанцінопальскі Сафійскі сабор* (532—537), С. ў гарадах Вормс, Майнц, Трыр, Шпаер (Германія), Саламанка (Іспанія; усе раманскі стыль), *Светыцхавелі* (Грузія, 1010—29), *Ланскі сабор*, *Кёльнскі сабор*, *Парыжскай Божай Маці сабор*, *Рэймскі сабор*, *Шартрскі сабор*, С. ў Мілане (Італія), Кентэрберы (Вялікабрытанія; усе готыка), *Рыжскі Домскі сабор* (раманагатычны стыль з рысамі барока), *Рымскі сабор святога Пятра*, С. Санта-Марыя дэль Ф'ёрэ ў Фларэнцыі (Італія, абодва рэнесанс), св. Хрыстафора ў Гаване, св. Гала ў г. Санкт-Гален (Швейцария), Успенскі ў Смаленску (усе барока), *Ісакіеўскі сабор* і *Казанскі сабор* у Пецярбургу, св. Паўла ў Лондане, кафедральны ў Вільнюсе (усе класіцызм) і інш. Вылучаюцца помнікі стараж.-рус. і сярэдневяковага дойлідства — *Наўгародскі Сафійскі сабор*, *Уладзімірскі Дзмітрыеўскі сабор*, саборы *Крамля Маскоўскага*, Пакроўскі С., што на Рове ў Маскве (гл. *Васіля Блажэннага храм*) і інш.

На Беларусі С. вядомы з 11 ст. Найб. значныя з іх: *Полацкі Сафійскі сабор* (11—17 ст.), *Гомельскі Петрапаўлаўскі сабор*, *Магілёўскі Іосіфаўскі сабор*, *Пружанскі сабор Аляксандра Неўскага*, Пакроўскі С. у Віцебску (усе класіцызм), *Барысаўскі Васкрасенскі сабор* (псеўдарус. стыль) і інш. У Мінску кафедральным правасл. С. з'яўляецца Святадухаўскі сабор (у будынку *Мінскага касцёла* і *кляштара бернардзінак*). Гал. храмы манастыроў: Успенскі С. *Жыровіцкага Успенскага манастыра*, Крыжаўзвіжанскі сабор і Спаса-Праабражэнская царква *Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра* і інш. Зрэдку С. наз. храм, які мае некалькі прыдзелаў (алтароў). 3) У іканаграфіі С. — кампазіцыйна пабудаваная выява некалькіх асоб ці мноства святых, Сіл нябесных, аб'яднаных паводле прынцыпу іх узаемасувязі. Напр., С. апосталаў, С. архангела Міхаіла, С. бел. святых (пасля кананізацыі С. Новапакутнікаў Мінскай епархіі напісаны і асвячоны аднайм. абраз; 1999, іканапісец П.Жараў), а таксама складаныя іканапісныя сюжэты (напр., С. архангела Міхаіла, С. Маці Божай, С. Іаана Прадцечы).

Сабор святога Паўла ў Лондане.

Сабор у г. Бразілія. 1970.

Успенскі **сабор** у г. Уладзімір (Расія).

Сабор-крэпасць у г. Трыр (Германія).

Літ.: Соборы мира: Пер. с англ. М., 1998.

Г.А.Лаўрэцкі.

САБО́РНАЕ ЎЛАЖЭ́ННЕ 1649, першы друкаваны помнік заканадаўства Рас. дзяржавы, які адлюстраваў эвалюцыю сац.-паліт. ладу краіны ад саслоўна-прадстаўнічай манархіі да *абсалютызму*. Распрацавана камісіяй на чале з кн. М.І.Адоеўскім, прынята 8.2.1649 Земскім саборам 1648—49. Складаецца з 25 глаў і 967 артыкулаў. Рэгламентавала пытанні дзярж., маёмаснага і крымін. (асабліва цяжкія пакаранні за злачынствы супраць цара і баяр) права, судаводства. Стварала ўмовы для сцірання межаў паміж памеснай і вотчыннай формамі зямельнай уласнасці.

Пасадскае насельніцтва, у т.л. са свабодных раней ад *цягла* «белых» слабод, вылучалася ў асобны стан *пасадскіх людзей* і прымацоўвалася да *пасадаў*. С.ў. канчаткова аформіла *прыгонныя права* праз увядзенне бестэрміновага

вышуку збеглых сялян. Крыніцы С.ў.: *Кормчыя кнігі*, *Судзебнік 1550*, Указныя кнігі прыказаў, *Статут Вялікага княства Літоўскага 1588* і інш. С.ў. ідзе ўслед за Статутам ВКЛ у структуры і падборы казусаў, часам дае даслоўныя вытрымкі з яго. Дзейнічала да 1830-х г.

Публ.: Соборное уложение 1649 г.: Текст, коммент. Л., 1987.
Літ.: Тихомиров М.Н., Епифанов П.П. Соборное уложение 1649 г. М., 1961. *Г.В.Прыбытка.*

САБО́РНАСЦЬ, кафалічнасць, рэлігійна-багаслоўскае паняцце, якое азначае адзінства, цэласнасць царкоўнага арганізма. Пры абвяшчэнні сябе саборнай, ці кафалічнай, пэўная царква імкнецца да адзінства і адзінасці ў свеце. Вытокі ідэі хрысціянскай С. ў вучэнні апостала Паўла пра царкву. Вызначэнне паняцця «С.» набыло самастойнасць у працах аднаго з заснавальнікаў *славянафільства* А.С.Хамякова, які лічыў, што толькі ў правасл. царк. сабораў выяўляецца «адзінства ў мностве», якога патрабуе прырода хрысц. царквы, чалавека і грамадства. Ён лічыў, што толькі правасл. царква арганічна спалучае прынцыпы свабоды і адзінства і ўсведамляе ідэю С. як вышэйшую Божую аснову царк. жыцця; процілстаўляў ёй каталіцкую царкву, якая быццам бы грунтуецца на «адзінстве без свабоды», і пратэстанцкую, нібыта заснаваную на «свабодзе без адзінства». Паняцце «С.» стала цэнтр. у правасл.-сла-



Крыжаўзвіжанскі **сабор** у г. Полацк.

вянафільскім кірунку рус. рэліг. філасофіі. К.С.Аксакаў атаясамляў С. і абшчыну, дзе, на яго думку, асоба «свабодная, як у хоры». У.С.Салаўёў трансфармаваў ідэю С. ў ідэю ўсеадзінства, якую вызначаў як «паўнату быцця». С.М.Трубяцкой процілстаўляў ідэю С. індывідуалізму і калектывізму і вызначаў С. як супадзенне рэліг., маральнага і сац. пачаткаў. С.Л.Франк тлумачыў С. як «унутр. арганічнае адзінства», якое ляжыць ў аснове чалавечых зносін. С.М.Булгакаў лічыў, што С. з'яўляецца асновай праваслаўя як «адзінае жыццё ў адзінай ісціне». П.А.Флорэнскі спрабаваў аб'яднаць паняцці С. і ўсеадзінства. Як эквівалент С. ўжываецца таксама паняцце «*салідарнасць*» як агульнасць інтарэсаў, адзінае разуменне прынцыпаў светапогляду і сумесная адказнасць.

Літ.: Керимов В.И. Историософия А.С.Хомякова. М., 1989; Франк С.Л. Духовные основы общества. М., 1992; Соловьев В.С. О христианском единстве. М., 1994; Хомяков А.С. Сочинения богословские. СПб., 1995; Булгаков С.Н. Два града: Исслед. о природе обществ. идеалов. СПб., 1997. *М.В.Тараткевіч.*

САБО́РНЫ РУХ, плынь у каталіцкай царкве ў 14 — пач. 15 ст. Яго ідэолагі адхілялі дамаганні *папства* на універсальную ўладу, яны патрабавалі падпарадкавання папства дзяржаве ў свецкіх і *Усяленскаму сабору* ў царк. справах. Рух абумоўлены ўзмацненнем у Еўропе цэнтралізаваных дзяржаў, імкненнем нац. цэркваў дасягнуць большай самастойнасці і меншай залежнасці ад папскага прастола, ростам нар.-ератычных рухаў і падзеннем аўтарытэту папскай улады. Ідэолагамі С.р. была частка вышэйшых царк. іерархаў і свецкіх феадалаў (Ж.Жэрсон, П.д'Айі, Мікалай Кузанскі). Практычнай рэалізацыяй патрабаванняў С.р. было скліканне па ініцыятыве кардыналаў без згоды папы Пізанскага (1409, не прызнаны каталіцкай царквой) і Канстанцкага (1414) сабораў, на якіх прыняты рашэнні, накіраваныя на абмежаванне папскай улады. Прынцыпы С.р. замацаваны пастановамі Базельскага сабора (1431—49). Але адсутнасць адзінства ў царк. вярхах дазволіла папу Яўгенію IV нейтралізаваць пастановы Базельскага сабора. На Фларэнційскім саборы (1438—45) С.р. асуджаны. У 1460 булай папы Пія II забаронена апеляцыя да Усяленскага сабора. У далейшым Усяленскія саборы склікаліся толькі паводле рашэння папы. *М.В.Тараткевіч.*

САБО́РНЫЯ ШКО́ЛЫ, сярэднія навуч. ўстановы ў эпоху сярэдневякоўя пры саборах (епіскапскіх кафедрах) у буйнейшых гарадах Еўропы. Давалі больш шырокую адукацыю, чым *манастырскія школы* і *царкоўнапрыходскія школы*. Навучалі чытанню, пісьму, граматыцы, лічэнню, царк. спевам. У перыяд позняга сярэдневякоўя ў некат. С.ш. выкладаліся прадметы трывіума (граматыка, рыторыка, дыялектыка), у асобных давалі ся звесткі з квадрывіума (арыфметыкі, геаметрыі, астраноміі, музыкі).

СА́БРА І ШАЦІ́ЛА, назва двух лагераў палесцінскіх бежанцаў у сталіцы Лівана Бейруце. Набылі вядомасць у час уварвання войск Ізраіля ў Ліван у 1982, калі 15—17 ліст. саюзная Ізраілю міліцыя хрысціян-маранітаў учыніла там разню мірных жыхароў, у выніку чаго загінула ад 1 да 2 тыс. жанчын, дзяцей і старых. Ізраільскія войскі, якія знаходзіліся побач, не прадухілілі гэтыя забойствы, што выклікала ўсеагульнае асуджэнне Ізраіля сусв. супольнасцю.

САБСА́Й Пінхас (Пётр) Уладзіміравіч (1.7.1893, г. Адэса, Украіна — 1980), азербайджанскі скульптар. Нар. мастак СССР (1973). Правадз. чл. АМ СССР (1947). Вучыўся ў Адэскім маст. вучылішчы (1908—15), Ленінградскай АМ (1922—25). З 1926 жыў у Баку. Выкладаў у Азерб. маст. вучылішчы (з 1928). Аўтар помнікаў М.Ф.Ахундаву (1930), С.Кіраву (1939; Дзярж. прэмія СССР 1942) і інш. у Баку, шматлікіх партрэтаў і твораў у галіне манум. рэльефу.

САБУ́Р, высушаны сок лісця розных відаў алоэ сям. асфадэлавых. Чорна-бурыя кавалкі ці парашок з непрыемным пахам і горкім смакам. Добра растварэцца ў гарачай вадзе, спірце, растворах шчолачаў. Найб. важны кампанент — алаіны (сумесь антрагліказідаў). Выкарыстоўваюць у асн. у ветэрынарыі як слабіцельны і жаўцягонны сродак; мясцова — для дэзінфекцыі і паскарэння эпітэлізацыі.

СА́ВА (Sava), рака ў Славеніі, Харватыі, Босніі і Герцагавіне, Югаславіі, найб. мнагаводны прыток р. Дунай. Даўж. 940 км, пл. басейна каля 95 тыс. км^2. Вытокі ў Юлійскіх Альпах, сярэдняе і ніжняе цячэнне па паўд. ускраіне Сярэднедунайскай раўніны. Асн. прытокі — Купа, Уна, Врбас, Босна, Дрына (справа); цякуць пераважна па Дынарскім нагор'і. Сярэдні расход вады ў вусці 1760 м^3/с. Мнагаводная ў зімова-веснавы час. Суднаходная да г. Сісак (592 км). У даліне С. — гарады Любляна (Славенія), Заграб (Харватыя); у вусці — Белград (Югаславія).

САВА́, вёска ў Горацкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Проня, на скрыжаванні аўтадарог на Горкі, Оршу і Дуброўна. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 15 км на ПнЗ ад г. Горкі, 101 км ад Магілёва, 5 км ад чыг. ст. Зубры. 389 ж., 176 двароў (2001). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

САВА́ РЫ́БНАЯ, птушка сям. савіных, гл. *Пугач рыбны*.

СА́ВАН (грэч. sabanon ад араб. savan; паходзіць ад назвы мясцовасці каля г. Багдад), 1) пахавальны ўбор з белай тканіны для нябожчыка. 2) У пераносным значэнні С. — покрыва, пялёнка са снегу, туману і інш. (напр., снежны С., з белых кветак С.).

САВА́НА (Savannah), рака на ПдУ ЗША. Даўж. 725 км, пл. басейна 27,2 тыс. км^2. Пачынаецца ў Апалачах, перасякае плато Підмант і Прыатл. нізіну, упадае ў Атл. ак. Веснавыя паводкі. Сярэдні расход вады 336 м^3/с. Суднаходная да г. Агаста (356 км), вышэй якога буйное вадасховішча. ГЭС. Каля вусця — порт Савана.

САВА́НА (Savannah), горад на ПдУ ЗША, у штаце Джорджыя. Засн. ў 1773. 131,7 тыс. ж., з прыгарадамі каля 250 тыс. ж. (1998). Порт на Атлантычным узбярэжжы, у вусці р. Савана. Аэрапорт. Буйны цэнтр суднабуд. і суднарамонтнай, цэяюлозна-папяровай і цукр. прам-сці. Развіты таксама хім. (вытв-сць мінер. угнаенняў, пігментаў) і дрэваапр. прам-сць; вытв-сць авіяц. рухавікоў. Чайныя ф-кі. Акіянаграфічны ін-т. Марскі музей. Акварыум.

САВАНА́Р, возера ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Друйка, за 10 км на З ад г. Браслаў. Пл. 0,75 км^2, даўж. 1,4 км, найб. шыр. 1 км, найб. глыб. 3,8 м, даўж. берагавой лініі 5,1 км. Пл. вадазбору 49,2 км^2. Катлавіна падпруднага тыпу, падзяляецца на зах. і ўсх. катлавіны. Схілы выш. 5—10 м, стромкія, параслі хмызняком. Берагі зліваюцца са схіламі, моцна парэзаныя, утвараюць 5 заліваў. Дно плоскае, да глыб. 1,5 м пясчанае, глыбей — сапрапелістае, каля ўсх. берага пясчаная водмель. З астравы агульнай пл. 0,8 га. Паўд.-зах. ч. возера і залівы зарастаюць. Упадаюць 2 ручаі, вытак у воз. Бужа.

САВАНАРО́ЛА (Savonarola) Джыралама (21.9.1452, г. Ферара, Італія — 23.5.1498), фларэнційскі рэліг.-паліт. дзеяч, паэт. З 1475 чл. ордэна дамініканцаў, з 1479 прапаведаваў у гарадах Паўн. Італіі. З 1491 прыёр кляштара Сан-Марка ў Фларэнцыі, дзе аднавіў строгія нормы манаскага жыцця. Выкрываў тыранію *Медычы*, сац. кантрасты, асуджаў свецкі характар гуманіст. культуры, крытыкаваў палітыку і лад жыцця рымскіх пап, патрабаваў рэформ у каталіцкай царкве ў духу вяртання да апостальскага ідэалу. Пасля падзення тыраніі Медычы (1494) спрыяў усталяванню ў Фларэнцыі рэсп. ладу ў інтарэсах сярэдніх гарадскіх пластоў. Абапіраючыся на фанатычныя групы моладзі, урачыста спальваў прадметы раскошы і кнігі, якія супярэчылі хрысц. маралі. Дзейнасць С. выклікала канфлікт з папам Аляксандрам VI, які ў 1497 адлучыў С. ад царквы. У 1498 у час хваляванняў у Фларэнцыі С. схоплены, абвінавачаны ў ерасі і пакараны смерцю.

Літ.: Херманн Х. Савонарола: Еретик из Сан-Марко: Пер. с нем. М., 1982.

САВА́ННА (ад ісп. sabana, запазычанага з мовы карыбскіх індзейцаў), занальны тып ландшафту, утвораны спалучэннем трапічнай і субтрапічнай ксерафільнай травяністай расліннасці (пераважна злакавай) з адзіночнымі і групамі дрэў, зараснікамі хмызняку. Пашырана ў Афрыцы, Паўд. і Цэнтр. Амерыцы, Аўстраліі і Індыі. У Бразіліі С. наз. *кампас*, у Венесуэле і Калумбіі — *льянас*. Развіваюцца таксама на месцы звезденых трапічных лясоў (другасныя С.).

Расліны С. прыстасаваны да працяглых засух: лісце цвёрдае, моцна апушанае, рэдуцаванае да калючак, кара дрэў тоўстая. Травяністыя злакі выш. да 3 м. Дрэвы (акацыя, бабаб, эўкаліпт і інш.) пераважна нізкарослыя, часта з парасонападобнай кронай, у некат. (бутэлечнае дрэва і інш.) ствалы ўтрымліваюць вял. запасы вады. Багаты і разнастайны жывёльны свет: сланы, насарогі, жырафы, ільвы, зебры, антылопы; з птушак характэрны страусы. Гл. таксама *Саванныя зоны*.

Савання ў сухі сезон.

САВА́ННЫЯ ЗО́НЫ, саваннаў і рэдкалессяў зоны, прыродныя зоны нізкіх шырот у субэкватарыяльным і трапічным (радзей — у субтрапічным) паясах Паўн. і Паўд. паўшар'яў. Займаюць каля 40% тэр. Афрыкі (на Пд ад Сахары), пашыраны ў Паўд. і Цэнтр. Амерыцы, Паўд. і Паўд.-Усходняй Азіі, Аўстраліі. С.з. уласціва пасатна-мусонная цыркуляцыя паветраных мас з выразным падзелам на сухі зімовы і вільготны летні сезоны. Працягласць дажджлівага сезону скарачаецца па меры аддалення ад экватарыяльнага пояса з 8—9 месяцаў да 2—3 месяцаў, колькасць ападкаў ад 2000 да 250 мм за год. Радыяцыйны баланс складае 250—335 кДж/см^2 (60—80 ккал/см^2). Т-ра самага халоднага месяца 4—20 °С, самага цёплага — 20—35 °С. Сутачныя ваганні т-ры паветра да 25 °С. Рачная сетка рэдкая. Рэкі мялеюць у сухі сезон, у дажджлівы — расход вады павялічваецца ў 15—20 разоў, узрастае цвёрды сцёк, схілавы і плоскасны змыў.

Рэльеф прадстаўлены згладжанымі паверхнямі, над якімі ўзвышаюцца эразійныя астанцы, захаваныя ад разбурэння шчыльнымі фералітнымі карамі. Бяссцёкавыя ўпадзіны ў вільготны перыяд забалочваюцца. У сухі сезон зніжаецца ўзровень грунтавых вод, актыўна праяўляюцца працэсы фіз. выветрывання, у больш засушлівых раёнах — дэфляцыі. Глебы чырвоныя, чырвона-карычневыя, чырвона-бурыя,, чорныя, шэра-карычневыя; з вял. колькасцю аксідаў жалеза, марганцу, алюмінію; характарызуюцца прамыўным рэжымам у дажджлівы сезон. Расліннасць: розныя тыпы *саваннаў*, саванныя лясы, ксерафітныя рэдкалессі і хмызнякі, уздоўж рэк галерэйныя лясы. Жывёльны свет: буйныя капытныя, драпежнікі, грызуны, бегаючыя птушкі, паўзуны і насякомыя. Вышынная пояснасць у гарах С.з. прадстаўлена знізу — рэдкалессямі або саваннамі, вышэй — сухімі і мезафітнымі лістападна-вечназялёнымі лясамі, яшчэ вышэй — хмызнякамі і горным стэпам. У С.з. субэкватарыяльных паясоў вылучаюцца падзоны вільготных высакатраўных саваннаў і саванных лясоў, тыповых саваннаў, апустыненых саваннаў і рэдкалессяў. Вырошчваюцца збожжавыя і клубневыя культуры, бавоўнік, джут, арахіс, сізаль, цукровы трыснёг і інш. Жывёлагадоўля (пераважна ў больш засушлівых абласцях). Ландшафты С.з. моцна зменены антрапагенным уздзеяннем (звядзенне лясоў, разворванне, выпальванне траў і інш.), што прыводзіць да іх *апустынівання*.

Р.Р.Паўлавец.

САВА́Р, адзінка частотнага інтэрвалу ў муз. акустыцы. 1 С. роўны частотнаму інтэрвалу з такімі адносінамі гранічных частот f_1 і f_2, што $\lg(f_2/f_1)=1{,}0023$. 1 С. = $=3{,}32 \cdot 10^{-3}$ актавы. Названа імем Ф.*Савара*.

САВА́Р (Savart) Фелікс (30.6.1791, г. Шарлевіль-Мезьер, Францыя — 16.3.1841), французскі фізік. Чл. Парыжскай АН (1827). Скончыў Страсбурскі ун-т (1816). Працаваў ваен. хірургам. З 1828 прафесар эксперым. фізікі ў Калеж дэ Франс. Навук. працы па акустыцы, электрамагнетызме, оптыцы і гідрамеханіцы. Вывучаў акустычны рэзананс і заканамернасці распаўсюджвання гуку ў розных асяроддзях, распрацаваў фіз. асновы канструявання струнных інструментаў. Разам з Ж.Б.*Біо* эксперыментальна вызначыў індукцыю магн. поля, створанага эл. токам (гл. *Біо—Савара закон*). Вынайшаў прыладу для вызначэння частаты гуку (кола С.), кварцавую пласцінку для вывучэння палярызаванага святла, палярыскоп. Яго імем названа адзінка частотнага інтэрвалу ў акустыцы — *савар*.

Літ.: Льоцци М. История физики: Пер. с итал. М., 1970.

САВАСЦЁНКА Аляксандр Андрэевіч (н. 11.6.1938, в. Новалугінцы Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. філосаф і эколаг. Канд. філас. н. (1967). Скончыў Маскоўскі пед. ін-т (1960). З 1965 у Мінскім пед. ін-це замежных моў (з 1972 заг. кафедры). З 1979 у ЦК КПБ (у 1990 заг. аддзела). З 1991 заг. аддзела ў Бел. н.-д. цэнтры «Экалогія». З 1993 у

сакратарыяце Міждзярж. экалагічнага савета. З 1999 нам. дырэктара Міждзярж. экалагічнага фонду. Навук. працы па праблемах сац. палітыкі, развіцця нар. гаспадаркі, навукі і культуры, сац. структуры грамадства, экалагічных аспектах сац.-эканам. развіцця Беларусі.

Тв.: Главное, бесценное богатство нашего общества. Мн., 1981 (разам з А.І.Самалем); Великое завоевание народа. Мн., 1984; Проблемы развития Республики Беларусь в контексте экологической безопасности. Мн., 1994 (у сааўт.).

САВАСЦЮ́К Антон Іванавіч (1.5.1927, в. Баравое Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. — 10.7.1998), бел. філосаф. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1989), д-р філас. н. (1984), праф. (1985). Скончыў БДУ (1955). З 1961 у Ін-це філасофіі і права Нац. АН Беларусі (з 1962 вучоны сакратар, з 1968 нам. дырэктара, у 1989—92 заг. аддзела). Навук. працы па сац. філасофіі і паліталогіі, праблемах сац. развіцця, структуры грамадства і сац. супярэчнасцей.

Тв.: В.И.Ленин о победе социализма в СССР. Мн., 1970; Основное противоречие нашей эпохи и мировой революционный процесс. Мн., 1980; Формирование общества социальной справедливости в Беларуси. Мн., 1996 (разам з Т.А.Антонавай).

СА́ВВА Вадзім Аляксандравіч (н. 13.7.1941, г. Самара, Расія), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1989). Скончыў БДУ (1963). З 1963 у Ін-це фізікі Нац. АН Беларусі (з 1996 заг. лабараторыі). Навук. працы па лазернай фізіцы і оптыцы. Развіў тэорыю дынамічных рэжымаў генерацыі светлавых імпульсаў у розных тыпах лазераў, распрацаваў метады селектыўнага ўзбуджэння малекулярных ваганняў магутнымі лазернымі імпульсамі, прапанаваў аналіт. метады даследавання дынамікі шматузроўневых малекулярных сістэм у магутных эл.-магн. палях.

Тв.: Аналитический метод в динамике квантовых многоуровневых систем — моделей многофотонного возбуждения молекул инфракрасным лазерным излучением (у сааўт.) // Современная оптика и лазерная физика. Мн., 1993.

САВЕ́ЙКАЎСКІ ПАРК, помнік садова-паркавага мастацтва ў в. Савейкі Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Закладзены



Савейкаўскі парк. Схема планіроўкі.

ў 1850 на пл. каля 10 га як сядзіба ў маёнтку Т.Навіцкага. Пейзажнагу тыпу. Цэнтр паркавай кампазіцыі — палац (зруйнаваны ў Вял. Айч. вайну, адноўлены ў 1950-я г. ў стылі неакласіцызму, цяпер — будынак санаторыя «Савейкі»), перад ім — партэр, абсаджаны масівамі з мясц. лісцевых парод. На ПнЗ ад палаца вял. паляна з ахоўнымі масівамі па перыметры. З паўн. боку — вял. штучны вадаём, пратокай звязаны з сістэмай вадаёмаў уздоўж узлеску. Дэндрасклад уключае больш за 25 відаў дрэў і кустоў, у т.л. елка, таполя белая, вольха, ліпа галандская, бэз венгерскі, ірга каласацветная, каліна канадская і інш.

А.М.Кулагін.

А.І.**Савасцюк**.

І.М.**Савельева**.

САВЕ́ЛІЧАЎ Аркадзь Аляксеевіч (н. 9.1.1933, в. Леніна Чарапавецкага р-на Валагодскай вобл., Расія), рускі пісьменнік. Скончыў БДУ (1965). З 1959 у газ. «Знамя юности» і «Советская Белоруссия». У 1967—78 у час. «Неман» (з 1974 заг. аддзела). З 1980 жыве ў Маскве. Друкуецца з 1959. Першая кн. аповесцей і апавяд. — «Зямны палац» (1970). Раманы «Інжынеры» (1975), «Заберагі» (1978) пра Вял. Айч. вайну. У зб. аповесцей «Зялёны дзень» (1973) узнімае маральна-этычныя пытанні. Аўтар нарысаў, дакумент. аповесці «Дынастыя Мудрацовых» (1966). Перакладае на рус. мову творы бел. пісьменнікаў.

Тв.: Сельга: Роман. М., 1987; Переборы: Роман. М., 1991; Потоп. М., 1993; Владимирское родео. М., 2000; Ночной Император. М., 2001.

САВЕ́ЛЬЕВА Ірына Мікалаеўна (н. 3.10.1931, С.-Пецярбург), бел. артыстка балета, педагог. Засл. арт. Таджыкістана (1957). Нар. арт. Беларусі (1964). Скончыла Ленінградскае харэагр. вучылішча (1951). З 1951 працавала ў Туркменскім, Чэлябінскім, Куйбышаўскім т-рах оперы і балета. У 1959—72 адна з вядучых танцоўшчыц Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Адначасова з 1962 (з перапынкамі) педагог Бел. харэагр. вучылішча (у 1971—77 маст. кіраўнік). Яе мастацтва вызначалі светлы, аптымістычны настрой, сталая тэхніка, артыстызм. Сярод партый: Марыя («Мара» Я.Глебава), Анежка («Святло і цені» Г.Вагнера), Адэта — Адылія, Аўрора («Лебядзінае возера», «Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Кітры, Гамзаці («Дон Кіхот», «Баядэрка» Л.Мінкуса), Царэўна («Казка пра мёртвую царэўну» У.Дзешавова на тэмы А.Лядава), Джульета («Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева), Фрыгія («Спартак» А.Хачатурана). Сярод вучаніц Л.*Бржазоўская*, Н.*Паўлава*.

Ю.М.Чурко.

І.**Савельева** ў ролі Джульеты.

САВЕ́ЛЬЕВА Таццяна Мітрафанаўна (н. 15.3.1938, в. Бестрань Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне псіхалогіі. Д-р псіхал. н. (1993), праф. (1998). Скончыла Мінскі пед. ін-т (1962). Настаўнічала. З 1971 у Нац. ін-це адукацыі. Даследуе праблемы навучання, выхавання і развіцця дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту; пытанні мыслення, маўлення, разумення і свядомасці чалавека ў сістэме бесперапыннай адукацыі. Аўтар вучэбна-метадычных дапаможнікаў для ВНУ і сярэдняй школы. Навук. кіраўнік распрацоўкі канцэпцыі «Нацыянальнай пачатковай школы» (1992).

Тв.: Психологические вопросы овладения русским языком. Мн., 1983; Дар слова: Говорим по-русски... Гаворым па-беларуску... Мн., 1986 (разам з М.Р.Яленскім); Мышление и деятельность — основные факторы развития человека в системе непрерывного образования // Пачатковае навучанне: Сям'я, дзіцячы сад, школа. 1999. № 5. С. 85—93.

САВЕ́НКА Сяргей Аляксандравіч (н. 10.9.1958, г.п. Гарадзішча Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне радыёлакацыі і радыёнавігацыі. Д-р тэхн. н. (1996), праф. (2001). Скончыў Мінскае вышэйшае ваеннае інж. вучылішча (1980). З 1997 у Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь. Навук. працы па праблемах шматпазіцыйнай актыўна-пасіўнай радыёлакацыі, радыёнавігацыі, прыладабудаванні і эл. сувязі. Распрацаваў методыку ацэнкі эфектыўнасці радыёлакацыйных комплексаў і сістэм, а таксама метады іх выпрабавання ў палявых умовах.

Тв.: Теория и техника совместной адаптивной обработки сигналов в активно-пассивных радиолокационных системах. Мн., 2000.

М.П.Савік.

САВЕ́РЧАНКА Іван Васілевіч (н. 2.4.1962, в. Маліноўка Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. літаратуразнавец, гісторык. Д-р філал. н. (2000). Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1983). З 1988 працуе ў Ін-це л-ры Нац. АН Беларусі. Даследуе гісторыю і тэорыю л-ры, гісторыю і філас. думку Беларусі,

культурнае ўзаемадзеянне еўрапейскіх народаў перыяду Рэнесансу, Рэфармацыі і барока, праблемы дзяржаўнасці і адукацыі. Аўтар прац: «Старажытная паэзія Беларусі, XVI — першая палова XVII ст.», «Астафей Валовіч», «Канцлер Вялікага Княства: Леў Сапега» (усе 1992), «Сымон Будны: Гуманіст і рэфарматар» (1993), «Апостал яднання і веры: Язэп Руцкі» (1994), «Хрысціянскі катэхізіс у кніжна-пісьмовай культуры ўсходніх славян эпохі Адраджэння і барока» (1998) і інш., навукова-папулярных артыкулаў пра Ф.Скарыну, Міколу Гусоўскага, І.Пацея, А.Рымшу, С.Косава, Кірылу Тураўскага, М.Сматрыцкага, М.Радзівіла Чорнага і інш. Працы С. вылучаюцца багаццем фактычнага матэрыялу, грунтоўнасцю навук. аналізу.

Тв.: Aurea mediocritas: Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. Мн., 1998. *І.У.Саламевіч.*

САВЕ́Т АБАРО́НЫ ЛІТВЫ́ І БЕЛАРУСІ́. Створаны ў Вільні 19.4.1919 урадам Літ.-Бел. ССР у сувязі з нападам на рэспубліку польскіх войск і цяжкім ваен. становішчам. З 28.4.1919 знаходзіўся ў Мінску. Старшыня В.С.*Міцкявічус-Капсукас*, чл. І.С.Уншліхт, М.І.Калмановіч, Я.Б.Бош, В.Г.Кнорын, К.Г.Цыхоўскі. Сканцэнтраваў усю дзярж. і ваен. ўладу і дзейнічаў у кантакце з РВС Літ.-Бел. арміі (з чэрв. 1919 — 16-й арміі). 2.5.1919 аб'явіў усеагульную мабілізацыю ў армію, 22 мая прыняў пастанову аб тэрміновых мерах па абароне Мінска, 31 мая падтрымаў прапанову ЦК РКП(б) аб стварэнні ваен. і паліт. саюза паміж усімі сав. рэспублікамі (1.6.1919 ЦВК Літ.-Бел. ССР ухваліў гэты дагавор). 17.7.1919 Савет скасаваны паводле рашэння ЦК КП(б)Б ЛіБ ад 14.7.1919 у сувязі з акупацыяй большай ч. тэр. рэспублікі польскімі войскамі і перабудовай вышэйшых сав. і парт. органаў Літ.-Бел. ССР. На неакупіраванай тэр. Беларусі ўлада перададзена Мінскаму губ. ваен.-рэв. к-ту і РВС Зах. фронту. *П.А.Селіванаў.*

«САВЕ́Т АБ'ЯДНА́НАГА ДВАРА́НСТВА», пастаянны орган з'ездаў упаўнаважаных дваранскіх таварыстваў — агульнарас. дваранскай арг-цыі. Існаваў з мая 1906 да пач. 1917. Быў выканаўчым органам з'ездаў. Выбіраўся на 3 гады, дзейнічаў паміж з'ездамі, складаўся са старшыні, 2 таварышаў і 12 членаў. Меў актыўную падтрымку пры дварах, сярод правых фракцый Дзярж. думы, у Дзярж. савеце. Часта выступаў у якасці паліт. саветніка імператара Мікалая II і ўрада. Адстойваў непарушнасць самадзяржаўя і памешчыцкага землеўладання, выступаў за актывізацыю барацьбы супраць рэв. руху, за ўзмацненне цэнзуры і інш. Вырашэнне агр. пытання бачыў у разбурэнні сял. абшчыны і пераходзе да хутарской сістэмы, рашучым правядзенні перасяленчай палітыкі. У час 1-й сусв. вайны страціў ранейшыя пазіцыі. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 спыніў існаванне.

САВЕ́Т БЯСПЕ́КІ ААН (СБ ААН), галоўны орган *Арганізацыі Аб'яднаных Нацый*, рашэнні якога абавязковыя для ўсіх яе членаў. Складаецца з 15 членаў (да 1965 было 11). З іх 5 пастаянныя — Расія (да 1991 — СССР), ЗША, Вялікабрытанія, Францыя і Кітай, і 10 непастаянных (да 1965 — 6), ратацыя якіх адбываецца кожныя 2 гады. Пры прыняцці рашэнняў дзейнічае прынцып аднагалосся пастаянных членаў СБ ААН. Паводле Статута ААН Савет Бяспекі адказвае за падтрымку міжнар. міру і бяспекі ў адпаведнасці з прынцыпамі і мэтамі ААН; разглядае міждзярж. спрэчкі ці інш. сітуацыі, якія могуць прывесці да міжнар. канфлікту; выпрацоўвае рэкамендацыі шляхоў уладжвання такіх спрэчак і ўмовы іх вырашэння; распрацоўвае планы для стварэння сістэмы рэгулявання ўзбраенняў; вызначае наяўнасць пагрозы міру ці акта агрэсіі і рэкамендуе меры, якія трэба прыняць; заклікае членаў ААН да выкарыстання эканам. санкцый ці інш. мер, якія не звязаны з выкарыстаннем сілы, дзеля прадухілення ці спынення агрэсіі; прадпрымае ваен. дзеянні супраць агрэсара; рэкамендуе далучэнне да ААН новых членаў; ажыццяўляе функцыі ААН па апецы ў «стратэгічных раёнах»; рыхтуе рэкамендацыі Ген. Асамблеі ААН аб прызначэнні Ген. сакратара ААН і сумесна з ёй выбірае суддзяў Міжнар. суда. На 1974—1975 непастаянным членам СБ ААН выбіралася БССР.

САВЕ́Т БЯСПЕ́КІ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, вышэйшы калегіяльны каардынацыйна-паліт. орган, які фарміруецца з мэтай рэалізацыі паўнамоцтваў прэзідэнта ў галіне забеспячэння нац. бяспекі краіны. Утвораны паводле пастановы Вярх. Савета Рэспублікі Беларусь ад 15.11.1991. У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь Савет бяспекі фарміруе і ўзначальвае прэзідэнт. Савет бяспекі разглядае пытанні ўнутр. і знешняй палітыкі краіны, якія закранаюць інтарэсы яе нац. бяспекі і абароны, прымае рашэнні па забеспячэнні паліт., эканам., ваен., гуманітарнай, экалаг. і інш. відаў бяспекі дзяржавы і яе грамадзян. У яго склад уваходзяць прэзідэнт, пастаянныя члены Савета (прэм'ер-міністр, старшыні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нац. сходу, кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта, дзярж. сакратар — памочнік прэзідэнта па нац. бяспецы), члены Савета (міністры абароны, унутр. спраў, замежных спраў, фінансаў, старшыні к-таў дзярж. бяспекі і дзярж. кантролю, ген. пракурор, а таксама інш. асобы, якіх прызначае прэзідэнт). Рашэнні Савета бяспекі афармляюцца ў выглядзе пастаноў, якія набываюць сілу пасля іх падпісання прэзідэнтам. Дзейнасць забяспечвае сакратарыят (да 1997 — апарат) Савета бяспекі. У 1992—94 Савет бяспекі ўзначальвалі старшыні Вярх. Савета Рэспублікі Беларусь С.С.Шушкевіч, потым М.І.Грыб. З 1994 палажэнне аб Савеце бяспекі і яго складзе зацвярджаюцца ўказамі прэзідэнта. Дзярж. сакратары Савета бяспекі: з 1994 В.В.Шэйман, з 2000 У.Р.Латыпаў, з 2001 Г.М.Нявыглас. *А.А.Тозік.*

САВЕ́Т ЕЎРАПЕ́ЙСКАГА САЮ́ЗА (да 18.11.1993 Савет Міністраў Еўрапейскіх Супольнасцей), адзін з кіруючых органаў (разам з *Еўрапейскім Парламентам, Камісіяй Еўрапейскіх Супольнасцей* і інш.) *Еўрапейскага Саюза*. Утварыўся ў выніку дзейнасці *Еўрапейскай Эканамічнай Супольнасці* (засн. ў 1957), якая паводле *Маастрыхцкага дагавора 1992* разам з інш. *Еўрапейскімі Супольнасцямі* трансфармавалася ў Еўрап. Саюз (ЕС). У Савет ЕС уваходзяць па 1 прадстаўніку ад урадаў усіх 15 краін — членаў ЕС. З'яўляецца заканад. і пагаджальным органам ЕС (вышэйшы за Еўрапарламент). Працуе ў Бруселі на непастаяннай аснове (міністры перыядычна збіраюцца на 1—2-дзённыя пасяджэнні). Абмяркоўвае пытанні фінансаў, эканомікі, знешняй палітыкі (удзельнічаюць адпаведныя міністры); рашэнні прымаюцца кваліфікаванай большасцю. Ад С.Е.С. адрозніваецца Еўрап. Савет — кансультатыўны орган, які складаецца з кіраўнікоў урадаў краін — членаў ЕС.

Літ.: Штайнер Ю. Еўрапейскія дэмакратыі: Пер. з англ. Мн., 1996. С. 292—293, 295—296.

САВЕ́Т ЕЎРО́ПЫ (СЕ; англ. Council of Europe, франц. Conseil de l'Europe), найстарэйшая міжпарламенцкая і міжурадавая кансультатыўная паліт. арг-цыя еўрап. дзяржаў, утвораная ў 1949 для садзейнічання інтэграцыйным працэсам у галіне правоў чалавека. Статут арг-цыі падпісаны 5.5.1949 (набыў сілу 3.8.1949) у Лондане на канферэнцыі 10 дзяржаўзаснавальніц (Бельгія, Вялікабрытанія, Данія, Ірландыя, Італія, Люксембург, Нарвегія, Нідэрланды, Францыя, Швецыя). Пазней у СЕ уступілі Грэцыя і Турцыя (1949), Ісландыя (1950), ФРГ (1951), Аўстрыя (1956), Кіпр (1961), Швейцарыя (1963), Мальта (1965), Партугалія (1976), Іспанія (1977), Ліхтэнштэйн (1978), Сан-Марына (1988), Фінляндыя (1989), Венгрыя (1990), Польшча (1991), Чэшская і Славацкая Федэратыўная Рэспубліка (1991, з 1993 асобна Чэшская і Славацкая Рэспублікі), Балгарыя (1992), Эстонія, Літва, Славенія, Румынія (усе ў 1993), Андора (1994), Албанія, Латвія, Македонія, Малдова, Украіна (усе ў 1995), Расія і Харватыя (1996), Грузія (1999); усяго 41 дзяржава (1999). Статус назіральніка маюць Ізраіль (з 1961) і ЗША (з 1996). Займаецца шырокім колам пытанняў чалавечага вымярэння: ад абароны правоў чалавека, умацавання дэмакр. шматпарт. рэжымаў, выпрацоўкі захадаў для вырашэння агульных праблем грамадскага жыцця, фарміравання агульнаеўрап. культ. супольніцтва да барацьбы з тэрарызмам. Спрыяе уніфікацыі

заканадаўства розных краін у галіне правоў чалавека. Праводзіць экспертызу ўзроўню абароны правоў асобы ў канкрэтнай краіне, у яе заканадаўстве і на практыцы. Органамі СЕ, рашэнні якіх маюць рэкамендацыйны характар, з'яўляюцца: К-т міністраў (уваходзяць міністры замежных спраў краін-членаў), Парламенцкая асамблея (уваходзяць прадстаўнікі нац. парламентаў дзяржаў-членаў), Ген. сакратарыят, Кангрэс абшчын і рэгіёнаў Еўропы. Пры СЕ функцыянуе шэраг спецыялізаваных устаноў — Еўрап. суд па правах чалавека, Еўрап. камісія па правах чалавека, Савет культ. супрацоўніцтва. Штаб-кватэра знаходзіцца ў г. Страсбур (Францыя) у Палацы Еўропы. Сімвал СЕ — зацверджаны 8.12.1955 еўрап. флаг (12 залатых зорак, размешчаных па крузе на блакітным фоне).

У 1993 упершыню адбыўся афіц. візіт ген. сакратара СЕ К.Лалюм'ер у Рэспубліку Беларусь. У 1993 Беларусь накіравала афіц. заяву з просьбай аб уступленні ў СЕ, у 1997 статус рэспублікі ў гэтай арг-цыі як «спецыяльна запрошанай» прыпынены.

Літ.: Штайнер Ю. Еўрапейскія дэмакратыі: Пер. з англ. Мн., 1996. *У.Я.Калаткоў.*

САВЕ́Т МІНІ́СТРАЎ ЗАМЕ́ЖНЫХ СПРАЎ (СМЗС), міжнародны орган у складзе міністраў замежных спраў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі і Кітая, які існаваў пасля 2-й сусв. вайны «для правядзення неабходнай падрыхтоўчай працы па мірным урэгуляванні». Засн. паводле рашэнняў *Патсдамскай канферэнцыі 1945.* За час існавання Савета адбылося 6 яго сесій: 1-я 11.9—2.10.1945 у Лондане, 2-я 25.4—16.5 і 15.6—12.7.1946 у Парыжы, 3-я 4.11—12.12.1946 у Нью-Йорку, 4-я 10.3—24.4.1947 у Маскве, 5-я 25.11—15.12.1947 у Лондане, 6-я 23.5—20.6.1949 у Парыжы. Да 1947 правёў значную работу па выпрацоўцы праектаў мірных дагавораў з краінамі, што ўдзельнічалі ў 2-й сусв. вайне на баку нацысцкай Германіі — Італіяй, Балгарыяй, Венгрыяй, Румыніяй і Фінляндыяй (гл. *Парыжскія мірныя дагаворы 1947*). Аднак з-за рознагалоссяў бакоў не ўдалося падрыхтаваць праекты мірных дагавораў з Германіяй і Японіяй. Разглядаў і справы, перададзеныя яму па ўзгадненні паміж урадамі — членамі Савета (пытанні пра спагнанне рэпарацый з Германіі, пра *перамешчаных асоб*, пра дату склікання і працэдуру працы *Парыжскай мірнай канферэнцыі 1946* і інш.). Спыніў дзейнасць у 1949.

У.Я.Калаткоў.

САВЕ́Т МІНІ́СТРАЎ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ (СМ Рэспублікі Беларусь), вышэйшы выканаўчы і распарадчы орган дзярж. улады, урад Рэспублікі Беларусь. Утвораны ў 1946 замест *Савета Народных Камісараў Беларускай ССР*, да 1991 СМ БССР, да 1994 і з 1996 СМ Рэспублікі Беларусь. Утвараўся Вярх. Саветам БССР (з 1991 *Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь*) і быў яму падпарадкаваны. У межах сваіх паўнамоцтваў забяспечваў кіраўніцтва нар. гаспадаркай, сац.-культ. будаўніцтвам, ажыццяўляў меры па падтрыманні грамадскага парадку, абароне інтарэсаў дзяржавы і ахове правоў грамадзян. Пастановы і распараджэнні ўрада былі абавязковыя да выканання на ўсёй тэр. Беларусі. Паўнамоцтвы СМ і яго пастаяннага органа — Прэзідыума, парадак арганізацыі і дзейнасці вызначаліся законам. З увядзеннем у 1994 пасады *Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь* і стварэнні пры ім *Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь* функцыі ўрада перайшлі да Кабінета Міністраў. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (са зменамі і дапаўненнямі), прынятая на рэсп. рэферэндуме 24.11.1996, зноў прадугледжвае ўрад — СМ Рэспублікі Беларусь як цэнтр. орган дзярж. кіравання, падсправаздачны ў сваёй дзейнасці Прэзідэнту і адказны перад парламентам — *Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь.* Урад краіны складаецца з Прэм'ер-міністра, яго намеснікаў і міністраў. У яго могуць уваходзіць і кіраўнікі інш. рэсп. органаў дзярж. кіравання. Прэм'ер-міністра прызначае Прэзідэнт са згоды Палаты прадстаўнікоў Парламента Рэспублікі Беларусь. СМ Рэспублікі Беларусь кіруе сістэмай падпарадкаваных яму органаў дзярж. кіравання і інш. органаў выканаўчай улады; распрацоўвае асн. кірункі ўнутр. і знешняй палітыкі і прымае меры па іх рэалізацыі; распрацоўвае і прадстаўляе Прэзідэнту для ўнясення ў Парламент праект рэсп. бюджэту і справаздачу аб яго выкананні; забяспечвае правядзенне адзінай эканам., фін., крэдытнай і грашовай палітыкі, дзярж. палітыкі ў галіне навукі, культуры, адукацыі, аховы здароўя, экалогіі, сац. забеспячэння і аплаты працы; прымае меры па забеспячэнні правоў і свабод грамадзян, абароне інтарэсаў дзяржавы, нац. бяспецы і абараназдольнасці, ахове ўласнасці і грамадскага парадку, барацьбе са злачыннасцю; выступае ад імя ўласніка ў дачыненні да маёмасці, якая з'яўляецца ўласнасцю Рэспублікі Беларусь, арганізуе кіраванне дзярж. уласнасцю; забяспечвае выкананне Канстытуцыі, законаў і дэкрэтаў, указаў і распараджэнняў Прэзідэнта; мае права адмены актаў мін-ваў і інш. рэсп. органаў дзярж. кіравання; ажыццяўляе інш. паўнамоцтвы, ускладзеныя на яго Канстытуцыяй, законамі і актамі Прэзідэнта; выдае пастановы, якія маюць абавязковую сілу на ўсёй тэр. Рэспублікі Беларусь. Кампетэнцыя, парадак арганізацыі і дзейнасці ўрада вызначаюцца Законам аб СМ Рэспублікі Беларусь на аснове Канстытуцыі.

Старшынямі СМ Беларусі ў розны час былі: П.К.Панамарэнка (1946—48), А.Я.Кляшчоў (1948—53), К.Т.Мазураў (1953—56), М.Я.Аўхімовіч (1956—59), Ц.Я.Кісялёў (1959—78), А.Н.Аксёнаў (1978—83), У.І.Бровікаў (1983—86), М.В.Кавалёў (1986—90), В.Ф.Кебіч (1990—94); прэм'ер-міністрамі — М.М.Чыгір (1994—96), С.С.Лінг (1997—2000), У.В.Ярмошын (2000—2001), Г.В.Навіцкі (з 10.1.2001). *М.І.Дзянісаў.*

САВЕ́Т НАРО́ДНЫХ КАМІСА́РАЎ, Саўнарком, СНК, вышэйшы выканаўчы і распарадчы орган дзярж. улады СССР — урад Савецкай дзяржавы. Упершыню абраны ў час *Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917* на 2-м Усерас. з'ездзе Саветаў 8.11.1917 як рабочы і сял. ўрад Расійскай Савецкай Рэспублікі. Паводле канстытуцыі 1918 наз. СНК РСФСР. У сувязі са стварэннем Саюза ССР у снеж. 1922 быў створаны саюзны ўрад — СНК СССР (зацверджаны на 2-й сесіі ЦВК СССР у ліп. 1923). Законам ад 15.3.1946 СНК СССР пераўтвораны ў *Савет Міністраў СССР.*

Старшынямі СНК СССР былі: У.І.Ульянаў (*Ленін*) (з 8.11.1917 старшыня СНК РСФСР, 6.7.1923 — 21.1.1924 — старшыня СНК СССР); А.І.*Рыкаў* (2.2.1924—19.12.1930), В.М.*Молатаў* (19.12.1930—6.5.1941), І.В.*Сталін* (6.5.1941—15.3.1946).

Літ.: Нелидов А.А. История государственных учреждений СССР, 1917—1936 гг. М., 1962; Первое советское правительство, окт. 1917 — июль 1918. М., 1991.

САВЕ́Т НАРО́ДНЫХ КАМІСА́РАЎ БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, Саўнарком БССР, СНК БССР, вышэйшы выканаўчы і распарадчы орган дзярж. улады, урад *Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі* (БССР) у 1920—46. Створа-

ны 18.12.1920 паводле дапаўненняў да Канстытуцыі Сацыяліст. Сав. Рэспублікі Беларусі 1919, прынятых *Другім Усебеларускім з'ездам Саветаў* у снеж. 1920. Да пастановы *Шостага Усебеларускага з'езда Саветаў 1924* (надзвычайнага), прынятай 16.3.1924, абавязкі старшыні ЦВК і СНК, а таксама наркома па замежных справах выконваліся адной асобай. Членамі СНК былі нар. камісары ўсіх наркаматаў, старшыні Савета нар. гаспадаркі і Надзвычайнай камісіі. Пры СНК дзейнічалі пастаянныя камісіі: Эканам. нарада, Камісія заканад. меркаванняў, Дзярж. планавая камісія. Кампетэнцыя і склад СНК БССР мяняліся ў сувязі з утварэннем СССР і зменамі ў дзярж.-прававой пабудове, са стварэннем новых цэнтр. органаў кіравання (наркаматаў і ўпраўленняў) галінамі эканомікі і культуры. СНК БССР ажыццяўляў агульнае кіраўніцтва рэспублікай праз наркаматы, выканкомы Саветаў. Ён прымаў пастановы і выдаваў распараджэнні па ўсіх пытаннях, якія не адносіліся выключна да кампетэнцыі Усебел. з'езда Саветаў, ЦВК БССР і яго Прэзідыума. СНК быў адказны перад з'ездам Саветаў і ЦВК БССР. Пастановы СНК аб дзярж. і мясц. бюджэце, падатках, адм.-тэр. падзеле рэспублікі, увядзенні мер аховы парадку ў ёй абавязкова зацвярджаліся Прэзідыумам ЦВК. Старшыня СНК БССР меў права прыпыняць распараджэнні акр. выканаўчых к-таў, нар. камісарыятаў, кіраўнікоў цэнтр. устаноў і ведамстваў, распараджэнні ўпаўнаважаных Нар. камісарыятаў СССР пры СНК БССР з наступным дакладам пра гэта СНК БССР на яго бліжэйшым пасяджэнні. Паводле *Канстытуцыі Беларускай ССР 1927* у склад СНК БССР уваходзілі Старшыня СНК, яго нам., старшыня ВСНГ, 10 наркомаў, кіраўнік ЦСУ (з правам рашаючага голасу), старшыня ДПУ БССР і 4 упаўнаважаныя нар. камісарыятаў СССР (з правам рашаючага ці дарадчага голасу паводле пастановы ЦВК БССР). Кампетэнцыя і структура нар. камісарыятаў і ўзаемаадносіны паміж іх асобнымі органамі вызначаліся агульным Палажэннем аб асобных камісарыятах. Паводле пастановы IX Усебел. з'езда Саветаў «Аб змяненнях і дапаўненнях Канстытуцыі (Асноўнага закона) Беларускай ССР» (22.1.1935) СНК БССР стаў адказным не толькі перад Усебел. з'ездам Саветаў і ЦВК БССР, але і перад Прэзідыумам ЦВК. Пры СНК пакінуты 2 пастаянныя камісіі: Эканам. савет і Дзярж. планавая камісія. Паводле *Канстытуцыі Беларускай ССР 1937* у склад СНК БССР уваходзілі Старшыня СНК, яго нам., старшыня Дзяржплана, 14 наркомаў (харч., лясной, лёгкай прам-сці, земляробства, збожжавых і жывёлагадоўчых саўгасаў, фінансаў, унутр. гандлю, унутр. спраў, юстыцыі, аховы здароўя, асветы, мясц. прам-сці, камунальнай гаспадаркі, сац. забеспячэння), упаўнаважаны К-та нарыхтовак СССР, нач. управлення па справах мастацтваў і 8 упаўнаважаных агульнасаюзных наркаматаў (абароны, замежных спраў, знешняга гандлю, шляхоў зносін, сувязі, воднага транспарту, цяжкай і абароннай прам-сці). Паводле указа Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 26.3.1946 СНК БССР пераўтвораны ў Савет Міністраў Беларускай ССР (гл. *Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь*).

Старшыні СНК БССР: А.Р.Чарвякоў (1920—24), Я.А.Адамовіч (1924—27), М.М.Галадзед (1927—37), Д.І.Валковіч (1937), А.Ф.Кавалёў (1937—38), К.В.Кісялёў (1938—40), І.С.Былінскі (1940—44), П.К.Панамарэнка (1944—46).

Літ.: Органы государственного управления Белорусской ССР (1919—1967 гг.). Мн., 1968; История государства и права Белорусской ССР. Т. 1—2. Мн., 1970—76. *Р.П.Платонаў.*

САВЕ́Т НАРО́ДНЫХ КАМІСА́РАЎ ЗАХО́ДНЯЙ ВО́БЛАСЦІ І ФРО́НТУ, выканаўчы орган *Абласнога выканаўчага камітэта Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту* (Аблвыкамзаха). Існаваў з 9.12.1917 па 25.2.1918 у Мінску. Утвораны на 1-м пленарным пасяджэнні Аблвыкамзаха. Старшыні СНК: К.І.*Ландар*, А.Ф.*Мяснікоў*, М.І.*Калмановіч*. У студз. 1918 замест пасады старшыні СНК утворана калегія камісараў. СНК меў аддзелы (камісарыяты) на чале з камісарамі: ваен. (Мяснікоў), унутр. спраў (Ландар), харч. (Калмановіч, І.Новікаў), фін. (І.П.Федзянёў, І.І.Рэйнгольд), нац. (С.І.Берсан), зямельны (Н.М.Дайнека, Саржынскі), працы (І.Я.Алібегаў, Панцялееў), гандлю і прам-сці (У.М.Фрэйман, Ф.Г.Шалаеў), нар. асветы (Л.П.Рэзаўскі, Шлес, Савацееў), юстыцыі (У.С.Селязнёў, Р.В.Пікель), апекі (В.П.Красноў, В.Л.Муха, В.І.Смірноў, Катлярэўскі), пошт і тэлеграфа (Несцярэнка), чыг. (Смірноў); кіраўнікі спраў — П.Осіпаў, В.Г.Кнорын, Савацееў, Селязнёў. У студз.—лют. 1918 арганізаваны аддзелы нар. гаспадаркі (П.Казлоў), па справах бежанцаў (М.Віглянскі), аховы здароўя (Л.Грамашэўскі); пры аддзеле па нац. справах створаны 2 пададдзелы па польскіх (С.Л.Гельтман) і яўр. (Фрыдлянд) справах. Ваен. аддзел рэарганізаваны ў Ваен. к-т на чале калегіі з 9 асоб (старшыня Мяснікоў); на яго ўскладзена задача стварэння Рабоча-Сял. Чырв. Арміі і дэмабілізацыя армій Зах. фронту. Юрысдыкцыя СНК пашыралася на Мінскую і неакупіраваную частку Віленскай губ. Дзейнічаў у кантакце з Мінскім Саветам рабочых і салдацкіх дэпутатаў, да 25.12.1917 паралельна з ім існаваў ранейшы орган улады — Ваен.-рэв. к-т Зах. фронту. СНК ажыццяўляў дэкрэты СНК РСФСР, ствараў органы сав. улады, скасоўваў старыя дзярж. ўстановы, наладжваў гасп. жыццё (выпуск тавараў нар. спажывання, устанаўленне 8-гадзіннага рабочага дня, дапамога беспрацоўным, адкрыццё пунктаў грамадскага харчавання і інш.). Узяў пад кантроль усе банкі і грашова-крэдытныя ўстановы, нацыяналізаваў шэраг прадпрыемстваў. Паводле яго загаду распушчаны *Усебеларускі з'езд 1917*, *Цэнтральная беларуская вайсковая рада*, арыштаваны шэраг бел. нац. дзеячаў, спынены выданні некат. газет. Для ўмацавання ўлады ў снеж. 1917—18 ствараліся рэв. трыбуналы і нар. суды. Дзейнасць СНК спынена 19.2.1918 у сувязі з наступленнем герм. войск. Пасля эвакуацыі ў Смаленск сваёй дзейнасці не аднаўляў. Паводле пастановы Аблвыкамзаха ад 25.2.1918 выканаўчая ўлада з названага органа не вылучалася.

М.Я.Сяменчык.

САВЕ́Т ПА АПЕ́ЦЫ ААН, адзін з галоўных органаў *Арганізацыі Аб'яднаных Нацый* у 1945—94. Складаўся з дзяржаў — членаў ААН, якія кіравалі тэрыторыямі пад апекай; з пастаянных членаў Савета Бяспекі ААН, якія не кіравалі тэрыторыямі пад апекай, і інш. членаў, выбраных Ген. Асамблеяй ААН на 3-гадовы тэрмін з такім разлікам, каб агульная колькасць членаў Савета размяркоўвалася пароўну паміж першымі і другімі. Пад кіраўніцтвам Ген. Асамблеі Савет быў правамоцны: разглядаць справаздачы ўлад, якія кіравалі адпаведнай тэрыторыяй; прымаць петыцыі і разглядаць іх, кансультуючыся з кіруючай уладай; перыядычна наведваць адпаведныя падапечныя тэрыторыі ва ўзгодненыя з кіруючай уладай тэрміны і рабіць захады ў адпаведнасці з умовамі пагадненняў аб апецы. Ён распрацоўваў анкеты адносна паліт., эканам., сац. прагрэсу і прагрэсу ў галіне адукацыі насельніцтва падапечных тэрыторый, а кіруючыя ўлады кожнай такой тэрыторыі прадстаўлялі Ген. Асамблеі штогадовыя даклады на аснове гэтых анкет. Да 1994 усе 11 падапечных тэрыторый, якія знаходзіліся ў веданні Савета, набылі самастойнасць. У сувязі з гэтым неабходнасць у Савеце адпала (гл. таксама *Апека міжнародная*).

Г.А.Маслыка.

САВЕ́Т ПРА́ЦЫ І АБАРО́НЫ (СПА), орган пры СНК РСФСР (з 17.7.1923 пры Саўнаркоме СССР) па каардынацыі дзейнасці нар. камісарыятаў у галіне гаспадаркі і абароны краіны ў 1920—37. Створаны ў выніку рэарганізацыі Савета рабочай і сял. абароны (існаваў у ліст. 1918 — крас. 1920). Дзейнічаў на правах камісіі. У яго ўваходзілі старшыня СНК (старшыня СПА), нар. камісары (па ваен. справах, шляхоў зносін, земляробства, харчавання, працы, Рабоча-сял. інспекцыі), старшыня ВСНГ, прадстаўнік ВЦСПС, кіраўнік Цэнтр. стат. ўпраўлення (з дарадчым голасам); мясц. органамі былі губернскія (абласныя), павятовыя і валасныя эканам. нарады. Старшынямі СПА былі У.І.Ленін (крас. 1920—1924), Л.Б.Каменеў (2.2.1924—19.1.1926), А.І.Рыкаў (19.1.1926—19.12.1930), В.М.Молатаў (19.12.1930—28.4.1937). Скасаваны паводле пастановы ЦВК СССР ад 28.4.1937, яго функцыі перададзены Эканам. савету пры СНК СССР.

САВЕ́Т РЭСПУ́БЛІКІ, 1) палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва *Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь*. 2) Назва вышэйшага кансультатыўнага органа дзяржавы ў Бразіліі і Грэцыі.

САВЕ́Т ЭКАНАМІ́ЧНАЙ УЗАЕМАДАПАМО́ГІ (СЭУ), міжнародная эканам. арганізацыя краін сацыяліст. арыентацыі ў 1949—1991. Штаб-кватэра знаходзілася ў Маскве. Члены: Албанія (спыніла ўдзел у 1961), Балгарыя, Венгрыя, В'етнам, ГДР (да 1990), Куба, Манголія, Польшча, Румынія, СССР, Чэхаславакія. У рабоце асобных органаў СЭУ з 1964 удзельнічала Югаславія, у якасці назіральнікаў — прадстаўнікі Анголы, Лаоса, КНДР, Эфіопіі. Дзейнасць рэгламентавалася Статутам і будавалася на аснове шматбаковых і двухбаковых пагадненняў аб сумесным планаванні, будаўніцтве аб'ектаў, спецыялізацыі і кааперараванні вытв-сці, навук.-тэхн. супрацоўніцтве. Спыніў дзейнасць у 1991.

САВЕТАЛО́ГІЯ, сукупнасць даследаванняў аб СССР у галіне гісторыі, палітыкі, ідэалогіі, гаспадаркі, культуры, якія праводзіліся да 1991 у заходніх краінах або ў цэнтрах, звязаных з імі. Частка даследчыкаў уключала ў С. і вывучэнне сацыяліст. краін — саюзнікаў СССР. Папярэднікамі ўласна С. былі пераважна рас. эмігранты 1920-х г. М.*Бярдзяеў*, Г.*Фядотаў*, М.Суханаў, а таксама К.*Каўцкі* і інш. Як навук. дысцыпліна афармілася ў 1940—50-я г. Гал. цэнтрамі былі Гувераускі ін-т вайны і рэвалюцыі ў ЗША, ун-ты ЗША і Зах. Еўропы (у Фрыбуры, Лондане, Парыжы). Выдаваліся часопісы па С.: «The Journal on Communist Studies» («Часопіс камуністычных даследаванняў»), «Slavic Review» («Славянскі агляд»), «Soviet Studies» («Савецкія даследаванні»), «Soviet Jewish Affairs» («Справы савецкіх яўрэяў» і інш. Найб. вядомыя саветолагі: З.*Бжазінскі*, Р.Конквест, С.Коэн, Р.Э.*Пайпс*, Л.Шапіра і інш. Напачатку С. мела практычна-прапагандысцкі характар ва ўмовах ідэалагічнага процістаяння капіталіст. і сацыяліст. сістэм. Творы вядучых саветолагаў пачалі выдавацца ў СССР з канца 1980-х г. Пасля распаду СССР (1991) цэнтры С. даследуюць посткамуністычныя і камуністычныя дзяржавы, пераважна ў Азіі (В'етнам, Кітай, Паўн. Карэя).

САВЕ́ТАЎ Аляксандр Васілевіч (24.11.1826, с. Гульнева Дзмітраўскага р-на Маскоўскай вобл. — 7.12.1901), бел. і расійскі аграном, першы ў Расіі і Беларусі д-р сельскай гаспадаркі (1867). Праф. (1855). Скончыў Горы-Горацкі земляробчы ін-т (1850). З 1853 вывучаў сельскую гаспадарку ў Расіі, Германіі, Бельгіі і інш. З 1855 заг. кафедры ў Горы-Горацкім земляробчым ін-це. У 1859—1900 у Пецярбургскім ун-це (заг. кафедры, з 1888 дэкан). Навук. працы па пытаннях земляробства, глебазнаўства, жывёлагадоўлі, перапрацоўкі с.-г. прадукцыі. Распрацоўваў рацыянальныя спосабы вядзення сельскай гаспадаркі, упершыню ў сусв. практыцы звязаў развіццё сістэм земляробства з сац.-эканам. ўмовамі. У 1885—91 разам з В.В.*Дакучаевым* выдаваў «Матэрыялы па вывучэнні рускіх глеб».

САВЕ́ТНІК, 1) назва пасады ў некат. прадстаўнічых органах дзярж. улады (міністэрствах, пасольствах і пад.), таксама асоба, якая займае гэтую пасаду. Напр., С. юстыцыі, С.пасольства. 2) У дарэв. Расіі С. наз. чыны розных класаў паводле іерархіі рангаў, што існавалі ў цывільнай службе (напр. надворны С., тытуярны С., калежскі С.).

САВЕ́ТЫ ДЭПУТА́ТАЎ, выбарныя прадстаўнічыя органы дзярж. улады ў б. СССР і ў Рэспубліцы Беларусь. Фарміруюцца на аснове ўсеагульнага, прамога і роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні. Упершыню ўзніклі ў Рас. імперыі ў ходзе рэвалюцыі 1905—07 як самадзейныя выбарныя органы кіраўніцтва рэв. барацьбой нар. мас і зачаткі рэв. органаў улады. Іх першай гіст. формай сталі Саветы рабочых дэпутатаў, што напачатку ствараліся для кіраўніцтва стачачнай барацьбой рабочых — у Іванава-Вазнясенску (сход упаўнаважаных дэпутатаў, май 1905), Луганску (лют. 1905), Кастраме (ліп. 1905) і інш. У перыяд найвыш. ўздыму рэвалюцыі восенню 1905 Саветы рабочых дэпутатаў узніклі больш як у 50 гарадах Расіі, у т.л. ў Маскве, Пецярбургу, Кіеве, Адэсе, Баку. Адначасова ў Маскве ўзнік Савет салдацкіх дэпутатаў, у Краснаярску — аб'яднаны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, у Севастопалі — Савет матросkіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў, у Чыце — Савет салдацкіх і казацкіх дэпутатаў, у Навінскай вол. Цвярской губ. — Савет сялянскіх дэпутатаў. У Латвіі і Грузіі як Саветы дзейнічалі сял. к-ты. На Беларусі некат. функцыі Саветаў выконвалі *Мінскі кааліцыйны савет 1905*, кааліцыйная камісія ў Віцебску; падобныя да Саветаў органы і стачачныя к-ты існавалі ў Гомелі, Пінску, Мазыры, Баранавічах, Ваўкавыску, Лунінцы. У Саветы ўваходзілі прадстаўнікі ад *меншавікоў*, *сацыялістаў-рэвалюцыянераў* і *бальшавікоў*. Маскоўскі Савет рабочых дэпутатаў (больш як 200 дэпутатаў), дзе вядучая роля належала бальшавікам, падрыхтаваў і ўзначаліў у горадзе *снежаньскую ўсерасійскую палітычную стачку 1905*, якая перарасла ва ўзбр. паўстанне. Усяго ў ходзе рэвалюцыі 1905—07 узніклі 62 Саветы, многія з якіх у працэсе абвастрэння рэв. барацьбы пачыналі дзейнічаць як органы рэв. улады: арыштоўвалі чыноўнікаў паліцыі, ствараліся баявыя дружыны, явачным парадкам уводзілі 8-гадзінны рабочы дзень, свабоду друку і г.д. Пасля паражэння рэвалюцыі 1905—07 Саветы спынілі існаванне. Зноў паўсюдна ўзніклі ў ходзе *Лютаўскай рэвалюцыі 1917*. У адрозненне ад Саветаў 1905—07 найчасцей ствараліся аб'яднаныя Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У сак. 1917 у губ., пав. гарадах і прамысл. цэнтрах было каля 600 Саветаў. Існавалі асобныя Саветы салдацкіх дэпутатаў, Саветы сял. дэпутатаў (губ., пав., валасныя). На фронце функцыі Саветаў выконвалі палкавыя, дывізіённыя, карпусныя, армейскія, франтавыя і інш. к-ты (гл. *Салдацкія камітэты*). У 1-й пал. сак. Саветы створаны ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Оршы, Бабруйску, Мазыры, Полацку, Слуцку, Рагачове, Барысаве. За 2 месяцы пасля Люг. рэвалюцыі на Беларусі створана 37 Саветаў, з іх 28 у сакавіку: 10 Саветаў рабочых дэпутатаў, 10 Саветаў салдацкіх дэпутатаў, 8 аб'яднаных Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. *З'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці* [Мінск, 4—7 (17—20).6.1917] выбраў Выканком Заходняга абл. Савета. Паміж пасяджэннямі функцыі абласнога выканкома выконваў *Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў*, у склад якога ўваходзілі прадстаўнікі Гомельскага, Магілёўскага, Барысаўскага, Бабруйскага, Аршанскага Саветаў.

Петраградскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў [створаны 27.2.(12.3.).1917] фактычна выконваў ролю Усерас. Савета. З яго згоды 2(15).3.1917 сфарміраваны *Часовы ўрад*. Калі Часовы ўрад і Саветы адначасова выконвалі ўладныя функцыі, устанавілася *двоеўладдзе*. У першыя месяцы пасля Люг. рэвалюцыі большасць у Петраградскім і ў большасці інш. Саветаў належала меншавікам і эсэрам. Напярэдадні Кастр. рэвалюцыі 1917 было 1429 Саветаў, у т.л. 706 — рабочых і салдацкіх дэпутатаў, 235 — рабочых, салдацкіх і сял. дэпутатаў, 455 — сял. дэпутатаў. І Усерас. з'езд сял. дэпутатаў [4(17).5 — 28.5.(10.6).1917] выбраў Цэнтр. выканаўчы к-т (ЦВК) Саветаў сял. дэпутатаў; І Усерас. з'езд Саветаў [3(16).6 — 24.6.(7.7).1917] — Усерас. Цэнтр. выканаўчы к-т (ВЦВК) Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. *Ліпеньскі крызіс 1917* прывёў да ліквідацыі двоеўладдзя і пераходу рэальнай улады ў рукі Часовага ўрада. Рэв. ўздым у час барацьбы з *Карнілава мяцяжом 1917* і роля бальшавікоў у яго разгроме абумовілі працэс бальшавізацыі Саветаў вядучых гарадоў Расіі. З перамогай праведзенай бальшавікамі Кастр. рэвалюцыі 1917, паводле рашэнняў *Другога Усерасійскага з'езда Саветаў* рабочых і салдацкіх дэпутатаў [25—27.10 (7—9.11).1917], уся ўлада ў краіне перайшла да Саветаў, якія сталі паліт. асновай новай (савецкай) дзяржавы. Расія ператварылася ў рэспубліку Саветаў. Напярэдадні Кастр. рэвалюцыі большасць Саветаў сял. дэпутатаў была пад уплывам эсэраў. Пад уплывам бальшавікоў Надзвычайны Усерас. з'езд Саветаў сял. дэпутатаў [10—25.11(23.11—8.12)1917] і II Усерас. з'езд Саветаў сял. дэпутатаў [26.11—10.12(9—20.12).1917] прызналі ўсе дэкрэты Сав. улады, прынялі рэзалюцыі пра неабходнасць аб'яднаць Саветы рабочых, салдацкіх і сял. дэпутатаў; злілі-

ся Цэнтральныя выканкомы Саветаў сял. дэпутатаў і Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У студз. 1918 III Усерас. з'езд Саветаў сял. дэпутатаў зліўся з III Усерас. з'ездам Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў [10—18(23—31).1.1918]. Утварыліся аб'яднаныя Саветы рабочых, салдацкіх і сял. дэпутатаў. Пасля стварэння Рабоча-сял. Чырв. Арміі [дэкрэт ад 15(28).1.1918] яны атрымалі назву Саветы рабочых, сял. і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Канстытуцыя РСФСР 1918, прынятая V Усерас. з'ездам Саветаў (4—10.7.1918), заканадаўча замацавала ўсталяваную сістэму Саветаў: Усерас. з'езд Саветаў — найвышэйшы орган улады РСФСР, абласныя, губ. (акруговыя), пав. (раённыя), валасныя з'езды Саветаў і Саветы гарадоў, пасёлкаў, вёсак. Усерас. з'езд Саветаў збіраўся 2 разы на год і выбіраў ВЦВК — найвыш. орган улады Сав. Расіі паміж з'ездамі. Мясц. з'езды выбіралі выканкомы, якія былі вышэйшымі органамі ўлады на гэтай тэр. паміж з'ездамі; выканкомы выбіраліся ў гарадах і вёсках.

Права выбіраць і быць выбранымі мелі ўсе дарослыя грамадзяне, апрача асоб, якія карысталіся наёмнай працай, служак рэліг. культаў, былых служачых і агентаў паліцыі, жандармерыі, ахоўных аддзяленняў, членаў дома Раманавых. У ходзе *грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі* 1918—22 меншавікі і эсэры за свае антыбальшавіцкія выступленні былі пазбаўлены права ўдзелу ў Саветах; Саветы сталі аднапартыйнымі, г.зн. трапілі пад поўны кантроль камуніст. (бальшавіцкай) партыі [да 1925 — РКП(б), да 1952 — ВКП(б), у 1952—91 — КПСС]. Пасля ўтварэння *Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік* (СССР) у структуры Саветаў адбыліся змены. Паводле Канстытуцыі СССР 1924 і канстытуцый саюзных рэспублік вярх. органам дзярж. улады стаў Усесаюзны з'езд Саветаў, паміж з'ездамі — ЦВК СССР; у рэспубліках — з'езды Саветаў і паміж з'ездамі — ЦВК рэспублік. Мясц. органамі ўлады былі: краявыя, абласныя, губ., акруговыя, пав., раённыя, валасныя з'езды Саветаў, паміж з'ездамі — выканкомы. Праз сістэму Саветаў Камуніст. партыя фактычна праводзіла сваю ўнутр. і знешнюю палітыку. Як органы ўлады Саветы, насуперак існуючаму ў многіх краінах прынцыпу *падзялення ўлад*, аб'ядноўвалі заканад. і выканаўча-распарадчыя, гасп. функцыі. Паводле Канстытуцыі СССР 1936 Саветы рабочых, сял. і чырвонаармейскіх дэпутатаў перайменаваны ў Саветы дэпутатаў працоўных, уся сістэма Саветаў рэарганізавана і набыла той выгляд, які з нязначнымі зменамі захавала да канца 1980-х г. Яна падзялялася на вышэйшыя і мясц. органы дзярж. улады. Да вышэйшых органаў належалі *Вярхоўны Савет СССР*, Вярх. Саветы саюзных і аўт. рэспублік (на Беларусі — Вярх. Савет БССР), да мясц. органаў — краявыя, абласныя, аўт. абласцей, нац. акруг, раённыя, гар., сельскія і пасялковыя Саветы. Усе Саветы ствараліся паводле адзінага прынцыпу дэмакр. цэнтралізму, адрозніваліся толькі аб'ёмам паўнамоцтваў і некат. арганізац. бакамі дзейнасці. Ніжэйстаячыя падпарадкоўваліся вышэйстаячым, былі падконтрольныя і падсправаздачныя ім. Саветы ўтваралі, выбіралі або прызначалі ўсе інш. органы сав. дзяржавы, надзялялі іх адпаведнымі паўнамоцтвамі і кантралявалі іх работу. У складзе Саветаў утвараліся адпаведныя камісіі для кіраўніцтва рознымі галінамі жыцця і гаспадаркі. Саветы не толькі прымалі дзярж. рашэнні, але і ажыццяўлялі іх праз утвораныя імі органы. Канстытуцыя 1936 скасавала абмежаванні выбарчых правоў грамадзян паводле класавага прынцыпу, абвясціла ўсеагульнае, роўнае і прамое выбарчае права пры тайным галасаванні. Як і раней, дзейнасць Саветаў фактычна аб'ядноўвала і накіроўвала Камуніст. партыя, якая праводзіла праз парт. групы, створаныя ў іх, сваю палітыку. У 1930-я г. склалася практыка вылучэння працоўнымі калектывамі па ініцыятыве вышэйстаячых парт. органаў толькі аднаго кандыдата на адно дэпутацкае месца, якая праіснавала да канца 1980-х г. Паводле Канстытуцыі СССР 1977 і прынятых у адпаведнасці з ёй рэсп. канстытуцый, Саветы атрымалі новую назву — Саветы нар. дэпутатаў, павялічаны тэрмін іх дзейнасці: Вярх. Саветаў СССР, саюзных і аўт. рэспублік з 4 да 5 гадоў, мясц. Саветаў — з 2 да 2,5 года. У час *перабудовы* (1985—91) адбывалася пэўная дэмакратызацыя дзейнасці Саветаў, у прыватнасці, пачалося вылучэнне больш як аднаго кандыдата на адно дэпутацкае месца, намецілася аднаўленне шматпартыйнасці. Закон ад 1.12.1988 унёс змены ў Канстытуцыю 1977, паводле якіх у якасці вышэйшага звяна сістэмы Саветаў уводзіліся *з'езд народных дэпутатаў СССР*, з'езды нар. дэпутатаў саюзных і аўт. рэспублік (у БССР не праводзіліся); тэрмін дзейнасці мясц. Саветаў павялічваўся да 5 гадоў. З увядзеннем у 1990—91 пасад прэзідэнтаў СССР, Расіі, і некат. інш. саюзных рэспублік роля і значэнне Саветаў у цэлым паменшыліся. З ліквідацыяй у снеж. 1991 СССР сістэма Саветаў у большасці б. сав. рэспублік скасавана (у Расіі — у 1993), замест іх ствараліся новыя вышэйшыя і мясц. прадстаўнічыя органы ўлады. Сістэма Саветаў у рэфармаваным выглядзе захавалася і канстытуцыйна замацавана на Украіне і ў Беларусі.

На Беларусі сістэма Саветаў рэфармавана ў адпаведнасці з Законам БССР «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» ад 20.2.1991, у які ўносіліся змены і дапаўненні ў 1995, 1996, 1997. Мясц. Саветы (акрамя сельскіх) пазбаўлены выканаўча-распарадчых функцый шляхам фактычнага аддзялення ад іх адпаведных выканкомаў, якія падсправаздачныя вышэйстаячым выканкомам і Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь. Саветы зацвярджаюць старшынь выканкомаў, якіх рэкамендуюць на гэтую пасаду старшыні вышэйстаячых выканкомаў, а старшынь абл. выканкомаў і выканкома Мінска — Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Паводле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 Саветы нар. дэпутатаў перайменаваны ў С.д. Да 1996 С.д. Беларусі складалі адзіную сістэму на чале з *Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь*. У адпаведнасці са змяненнямі і дапаўненнямі, унесенымі ў Канстытуцыю 1994 па выніках усенар. рэферэндуму 24.11.1996, замест Вярх. Савета створаны новы прадстаўнічы орган улады — *Нацыянальны Сход Рэспублікі Беларусь*. С.д. захаваліся як мясц. прадстаўнічыя органы дзярж. улады на тэр. адм.-тэр. адзінак і асн. звяно мясц. самакіравання. Дэпутаты С.д. базавага ўзроўню (раённыя, гарадоў абл. падпарадкавання) выбіраюць у Савет Рэспублікі Нац. Сходу па 8 дэпутатаў ад кожнай вобласці і Мінска. Больш падрабязна пра дзейнасць мясц. Саветаў Беларусі гл. ў арт. *Мясцовыя Саветы дэпутатаў*.

Літ.: Петриков П.Т. Советы депутатов трудящихся БССР и их роль в создании материально-технической базы коммунизма (1959—1965 гг.). Мн., 1972; Крупалевич В.А. На путях национального самоопределения: БНР — БССР—РБ. Мн., 1995. *А.А.Галаўко.*

САВЕ́ТЫ З'ЕЗДАЎ ПРАДПРЫЕ́МЦАЎ у Расіі, пастаянныя выканаўчыя органы прадстаўнічых арг-цый рус. буржуазіі — усерас., раённых, галіновых з'ездаў, якія дзейнічалі ў апошняй чвэрці 19 — пач. 20 ст. Выбіраліся на з'ездах прадпрыемцаў, дзейнічалі на падставе зацверджаных урадам статутаў. Былі цесна звязаны з дзярж. апаратам. Узначальваліся прадстаўнікамі дзелавой бурж. інтэлігенцыі, рашуча выступалі супраць рабочага руху. Іх значэнне ўзмацнілася ў 1-ю сусв. вайну 1914—18, калі яны выступілі ініцыятарамі мабілізацыі прам-сці, і асабліва пасля *Лютаўскай рэвалюцыі 1917*, пры *Часовым урадзе*. У 1917 налічвалася больш за 30 С.з.п., у т.л. 3 агульнарас. арг-цыі: саветы з'ездаў прадстаўнікоў прам-сці і гандлю (1906—18), біржавога гандлю і сельскай гаспадаркі (1905—18), акц. камерцыйных банкаў (1873—1918). Найб. уплывовыя раённыя і галіновыя саветы з'ездаў: горнапрамыслоўцаў Поўдня Расіі (1874—1918, Харкаў) і Урала (1898—1917, Екацярынбург, з 1905 Пецярбург), бакінскіх нафтапрамыслоўцаў (1884—1920, Баку), металлапрацоўчай прам-сці (1916—18, Петраград).

САВЕ́ТЫ НАРО́ДНАЙ ГАСПАДА́РКІ, гл. ў арт. *Вышэйшы савет народнай гаспадаркі*.

САВЕ́ТЫ РАБО́ЧЫХ ДЭПУТА́ТАЎ, гл. ў арт. *Саветы дэпутатаў*.

САВЕ́ТЫ РАБО́ЧЫХ І САЛДА́ЦКІХ ДЭПУТА́ТАЎ, выбарныя паліт. арг-цыі працоўных гарадоў, пасёлкаў і мястэчак, а таксама гарнізонных ваеннаслужачых у Расіі ў 1917—18. Гл. ў арт. *Саветы дэпутатаў*.

САВЕ́ТЫ РАБО́ЧЫХ, СЯЛЯ́НСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕ́ЙСКІХ ДЭПУТА́ТАЎ, гл. ў арт. *Саветы дэпутатаў.*

САВЕ́ТЫ СЯЛЯ́НСКІХ ДЭПУТА́ТАЎ, гл. ў арт. *Саветы дэпутатаў.*

САВЕ́ЦК, горад у Калінінградскай вобл. Расіі. Засн. ў 1288. Да 1946 наз. Тыльзіт. Порт на р. Нёман. Чыг. вузел. 43,6 тыс. ж. (1999). Прам-сць: цэлюлозна-папяровая, харч., лёгкая; карданажная і мэблевая ф-кі. Суднабудаванне. Драм. тэатр. Месца падпісання *Тыльзіцкага міру 1807.*

САВЕ́ЦКА-АМЕРЫКА́НСКІЯ ДАГАВО́РЫ І ПАГАДНЕ́ННІ. Пагадненне 1933 аб устанаўленні дыпламат. адносін, заключана 16 ліст. ў Вашынгтоне праз абмен нотамі. Пагадненне 1937 аб гандл. адносінах, заключана 4 жн. ў Маскве праз абмен нотамі; замяніла пагадненне аб гандл. узаемаадносінах 1935. Прадугледжвала, што ЗША прадаставяць СССР «безумоўны і неабмежаваны рэжым найбольш спрыяльнай нацыі» па ўсіх пытаннях, якія датычаць мытных пошлін, збораў, правіл і фармальнасцей, што маюць адносіны да ўвозу, продажу або выкарыстання ў ЗША сав. тавараў. Аналагічныя абавязкі ўзяў урад СССР. У гады 2-й сусв. вайны тавараабарот паміж СССР і ЗША рэгуляваўся гал. чынам пагадненнем ад 11.6.1942, а ў першыя пасляваен. гады — крэдытным пагадненнем ад 15.10.1945. У сувязі з разгортваннем *«халоднай вайны»* ўрад ЗША у пач. 1947 забараніў пастаўкі абсталявання ў СССР, а 23.6.1951 дэнансаваў пагадненне 1937. Пагадненне 1942 аб прынцыпах, якія могуць ужывацца да ўзаемнай дапамогі ў вядзенні вайны супраць агрэсіі, падпісана 11 чэрв. ў Вашынгтоне. Зыходзячы з прынцыпу, што абарона СССР супраць гітлераўскай агрэсіі мае жыццёва важнае значэнне для абароны ЗША, амер. ўрад абавязаўся забяспечваць СССР абароннымі матэрыяламі, абслугоўваннем і інфармацыяй. Сав. ўрад абавязаўся садзейнічаць абароне ЗША і заяўляў пра сваю гатоўнасць даваць ЗША матэрыялы, абслугоўванне, ільготы і інфармацыю. Гэта пагадненне завяршыла фарміраванне асн. ядра *антыгітлераўскай кааліцыі*, садзейнічала развіццю *ленд-лізу*. Асновы ўзаемаадносін паміж СССР і ЗША, падпісаны 29.5.1972 у Маскве. Дакумент зафіксаваў асн. прынцыпы сав.-амер. адносін. СССР і ЗША пагадзіліся, што ў ядз. век не існуе інш. асновы падтрымання адносін паміж імі, акрамя мірнага суіснавання. Абавязаліся рабіць усё магчымае, каб пазбягаць ваен. канфрантацый і не дапусціць узнікнення ядз. вайны, рэгуляваць рознагалоссі мірнымі сродкамі. СССР і ЗША заявілі аб сваім намеры расшырыць дагаворна-прававую базу сваіх узаемаадносін і прыкладаць намаганні, каб заключаныя паміж імі дагаворы і пагадненні ажыццяўляліся. Канчатковы вынік сваіх намаганняў СССР і ЗША бачаць у вырашэнні праблемы ўсеагульнага і поўнага раззбраення і ў забеспячэнні эфектыўнай сістэмы міжнар. бяспекі ў адпаведнасці з мэтамі і прынцыпамі ААН. СССР і ЗША заявілі, што яны прызнаюць суверэнную роўнасць усіх дзяржаў, падкрэслілі, што развіццё сав.-амер. адносін не накіравана супраць трэціх дзяржаў і іх інтарэсаў. Дагавор 1972 пра абмежаванне сістэм проціракетнай абароны, падпісаны 26 мая ў Маскве. СССР і ЗША абавязаліся: абмежаваць размяшчэнне сістэм проціракетнай абароны (ПРА) пэўнымі раёнамі, у якіх павінна быць не больш як 100 пускавых установак проціракет і не больш як 100 проціракет на стартавых пазіцыях; не ствараць, не вырабляць і не разгортваць сістэм ці кампанентаў ПРА марскога, паветр., касм. ці мабільна-наземнага базіравання; не ствараць, не вырабляць і не разгортваць пускавых установак проціракет, кожная з якіх пускае адначасова больш як адну проціракету; не перадаваць інш. дзяржавам і не размяшчаць па-за сваёй тэрыторыяй сістэмы ПРА і іх кампаненты, абмежаваныя гэтым дагаворам. Пратакол да пагаднення (падпісаны 3.7.1974; набыў сілу 24.5.1976) удакладніў, што кожны бок будзе мець толькі 1 раён размяшчэння ПРА.

Да важнейшых пагадненняў і дагавораў, заключаных паміж СССР і ЗША, таксама адносяцца: *Дагавор аб забароне і абмежаванні выпрабаванняў атамнай зброі 1963*; пагадненне 1973 аб прадухіленні ядз. вайны; дагавор 1974 аб абмежаванні падземных выпрабаванняў ядз. зброі; дагавор 1979 аб абмежаванні стратэг. наступальных узбраенняў; пагадненне 1973 аб супрацоўніцтве ў галіне даследавання Сусветнага акіяна; пагадненне 1973 аб навук.-тэхн. супрацоўніцтве ў галіне мірнага выкарыстання атамнай энергіі; пагадненне 1974 аб супрацоўніцтве ў галіне энергетыкі; пагадненне 1974 аб супрацоўніцтве ў галіне навук. даследаванняў у распрацоўках штучнага сэрца; доўгатэрміновае пагадненне 1974 аб садзейнічанні эканам., прамысл. і тэхн. супрацоўніцтву; агульнае пагадненне 1985 аб кантактах, абменах і супрацоўніцтве ў галіне навукі, тэхнікі, адукацыі і ў інш. галінах, гандл. пагадненні і інш. Праводзіліся таксама сав.-амер. перагаворы пра абмежаванне і скарачэнне стратэг. узбраенняў, пра абмежаванне ядз. узбраенняў у Еўропе, пра забарону хім. зброі і інш.

САВЕ́ЦКА-АНГЛІ́ЙСКІЯ ДАГАВО́РЫ І ПАГАДНЕ́ННІ. Гандлёвае пагадненне 1921, падпісана 16 сак. ў Лондане. Мела гандлёвы і паліт. характар. Азначала фактычнае прызнанне Сав. Расіі. Дзяржавы заявілі пра аднаўленне гандл. зносін і пра тое, што будуць уха́ляцца ад варожых дзеянняў і прапаганды адна супраць адной. Было першым пагадненнем, якое Сав. Расія заключыла з вял. капіталіст. дзяржавай, прарвала дыпламат. і эканам. блакаду Сав. Расіі. Мела сілу да разрыву сав.-англ. адносін 27.5.1927. Пагадненне 1937 (марское), падпісана 17 ліп. ў Лондане на 5 гадоў. Устанавіла асн. якасныя ліміты (водазмяшчэнне, узбраенне і інш.) для розных катэгорый ваен.-марскіх суднаў, якія адпавядалі лімітам, устаноўленым англа-франка-амер. дагаворам ад 25.3.1936 аб марскіх узбраеннях. У вер. 1939 урад Вялікабрытаніі прыпыніў дзеянне гэтага пагадненння. Пагадненне 1941 пра сумесныя дзеянні ўрадаў СССР і Вялікабрытаніі ў вайне супраць Германіі, падпісана 12 ліп. ў Маскве. Абавязвала сав. і брыт. ўрады памагаць і падтрымліваць адзін аднаго ў вайне супраць фаш. Германіі. Дало пачатак афармленню *антыгітлераўскай кааліцыі*, у 1942 заменена дагаворам. Дагавор 1942 аб саюзе і вайне супраць гітлераўскай Германіі і яе саўдзельнікаў у Еўропе, аб супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе пасля вайны, падпісаны 26 мая ў Лондане. Ч. 1 дагавора тоесная пагадненню 1941 і заставалася ў сіле да канца вайны. У ч. 2 вызначаны асн. прынцыпы пасляваеннага супрацоўніцтва СССР і Вялікабрытаніі: не ўмешвацца ва ўнутр. справы інш. дзяржаў, аказваць эканам. дапамогу, на заключаць ніякіх саюзаў і не ўдзельнічаць ні ў якіх кааліцыях, накіраваных супраць другога боку. Заключаўся на 20 гадоў. У сувязі з утварэннем блока НАТО і ваенным супрацоўніцтвам Вялікабрытаніі з Зах. Германіяй 7.5.1955 дагавор ануляваны СССР. Пагадненне 1968 аб навук.-тэхн. супрацоўніцтве, падпісана 19 студз. ў Лондане. Паводле яго бакі абавязаліся садзейнічаць развіццю навук.-тэхн. супрацоўніцтва паміж 2 краінамі на аснове раўнапраўя і ўзаемнай выгады. Доўгатэрміновае гандлёвае пагадненне 1969, падпісана 3 чэрв. ў Маскве. Бакі абавязаліся падтрымліваць і садзейнічаць заключэнню на камерцыйнай аснове пагадненняў, у т.л. доўгатэрміновых, з мэтай супрацоўніцтва і развіцця вытв. магутнасцей краін. Пагадненне 1974 пра развіццё эканам., навук.-тэхн. і прамысл. супрацоўніцтва, падпісана 6 мая ў Лондане. Бакі абавязаліся працягваць намаганні па развіцці і ўмацаванні ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Пратакол аб кансультацыях 1975, падпісаны 17 лют. ў Маскве. З мэтай умацавання ўзаемнага даверу і ўзаемаразумення, садзейнічання паглыбленню працэсу разрадкі міжнар. напружанасці і надання ёй незваротнага характару бакі дамовіліся расшыраць і паглыбляць паліт. кансультацыі па важных міжнар. праблемах, якія ўяўляюць узаемны інтарэс, а таксама па пытаннях двухбаковых адносін. Пагадненне 1977 аб прадухіленні выпадковага ўзнікнення ядз. вайны, падпісана 10 кастр. ў Маскве. Кожны з бакоў абавязаўся ажыц-

цяўляць і ўдасканальваць існуючыя арганізац. і тэхн. меры з мэтай прадухілення выпадковага або несанкцыянаванага выкарыстання ядз. зброі, якая знаходзіцца пад яго кантролем.

САВЕ́ЦКА-АФГА́НСКІЯ ДАГАВО́РЫ І ПАГАДНЕ́ННІ. Паводле дагавора 1921 аб дружбе, падпісаным 28 лют. ў Маскве, бакі пацвердзілі незалежнасць адзін аднаго і ўсталяванне дыпламат. адносін; узаемна абавязаліся не ўступаць з трэцяй дзяржавай у ваен. ці паліт. пагадненні, якія б пашкодзілі аднаму з бакоў. Сав. бок даваў Афганістану права свабоднага і бязмытнага транзіту тавараў праз сваю тэр., абавязаўся аказаць апошняму фін. і матэрыяльную дапамогу. Дагавор 1926 аб нейтралітэце і ненападзе, падпісаны 31 жн. ў Пагмане (Афганістан), прадугледжваў неўмяшанне ва ўнутр. справы адзін аднаго; недапушчэнне на сваёй тэр. ўзбр. атрадаў і арг-цый, варожых да інш. боку; няўдзел у саюзах і пагадненнях, накіраваных супраць інш. боку; нейтралітэт у выпадку канфлікту аднаго з бакоў з трэцяй дзяржавай. Дагавор 1931 аб нейтралітэце і ўзаемным ненападзе, падпісаны 24 чэрв. ў Кабуле, пацвярджаў палажэнні дагавора 1926. Пагадненне 1946 па памежных пытаннях, падпісана 13 чэрв. ў Маскве, устанаўлівала сав.-афганскую мяжу па тальвегу (найб. глыбокай частцы) р. Амудар'я. Пагадненне 1956 пра супрацоўніцтва ў развіцці Афганістана, падпісана 28 студз. ў Кабуле, давала магчымасць афганскаму боку набыць сав. крэдыт, што дапамагло Афганістану пераадолець эканам. страты, панесеныя ім у выніку канфлікту з Пакістанам. Дагавор 1978 аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж СССР і Дэмакр. Рэспублікай Афганістан (ДРА), падпісаны 5 снеж. ў Маскве, пацвярджаў прынцыпы дагавораў 1921, 1926 і 1931; прадугледжваў узаемныя кансультацыі бакоў з мэтай забеспячэння бяспекі і незалежнасці адзін аднаго, шырокае супрацоўніцтва і аказанне СССР Афганістану дапамогі ў паліт., эканам., культурнай, ваен. і інш. галінах. Стаў фармальнай падставай для ўводу сав. войск у ДРА у снеж. 1979. Скасаваны пасля падзення рэжыму *Наджыбулы* ў крас. 1992.

САВЕ́ЦКА-ГЕРМА́НСКІЯ ПАГАДНЕ́ННІ, пагадненні і дагаворы, заключаныя ў 20 ст. паміж СССР (да канца 1922 РСФСР) і Германіяй [у 1949—90 асобна з Герм. Дэмакр. Рэспублікай (ГДР) і ФРГ]. Брэст-Літоўскі мірны дагавор 1918 (гл. *Брэсцкі мір 1918*). Часовае пагадненне 1921 аб гандл.-эканам. адносінах, падпісана 6 мая ў Берліне на нявэўны тэрмін. Прадугледжвала стварэнне гандл. прадстаўніцтва РСФСР у Германіі, аднаўленне двухбаковых консульскіх адносін, паштовых, тэлегр. і радыётэлегр. зносін, гандл. сувязей і інш. Заключэнне пагаднення азначала прызнанне РСФСР Германіяй дэ-факта. Скасавана дагаворам 1925. Дагавор 1922 (гл. *Рапальскі дагавор 1922*). Дагавор 1925, падпісаны 12 кастр. ў Маскве. Складаўся з агульнай часткі і асобных пагадненняў (Аб пасяленні і агульнаправавой абароне, Эканамічнага, Чыгуначнага, Аб мараплаванні, Аб падатках, Аб гандл. трацейскіх судах, Аб ахове прамысл. уласнасці). У развіцці дагавора заключаны пратакол 21.12.1928. Дагавор 1926 аб ненападзе і нейтралітэце, падпісаны 24 крас. ў Берліне на 5 гадоў. Пацвердзіў, што асновай адносін паміж СССР і Германіяй застаецца Рапальскі дагавор 1922. Прадугледжваў, што ў выпадку нападу на адзін з дагаворных бакоў трэцяй краіны або групы трэціх дзяржаў другі бок абавязваўся захоўваць нейтралітэт на працягу ўсяго ўзбр. канфлікту. Пратаколам ад 24.6.1931 дагавор працягнуты на нявэўны тэрмін. Фармальна ён дзейнічаў да нападу нацысцкай Германіі на СССР (22.6.1941). Дагавор 1939 аб ненападзе (гл. *Пакт Рыбентропа—Молатава 1939*). Дагавор 1939 аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй, падпісаны 28 вер. ў Маскве наркомам замежных спраў СССР В.М.Молатавым і міністрам замежных спраў Германіі І.Рыбентропам. Прадугледжваў «аднаўленне міру і парадку» на тэр. «былой Польскай дзяржавы» і ажыццяўленне тут «неабходнага дзярж. пераўладкавання» (на З ад вызначанай мяжы яно праводзілася Германіяй, на У — Сав. Саюзам); «пераўладкаванне» разглядалася як «надзейны фундамент для далейшага развіцця сяброўскіх адносін» паміж народамі СССР і Германіі. Вызначыў сав.-герм. граніцу па лініі рэк Піса, Нараў, Буг, Вісла, Сан. Германія абавязвалася не ўмешвацца ў справы Зах. Беларусі і Зах. Украіны. Сакрэтным пратаколам да дагавора ў сферу інтарэсаў СССР уключалася Літва, а Германія атрымлівала ч. Польшчы (Люблінскае і ч. Варшаўскага ваяв.). 2-м сакрэтным пратаколам бакі абавязваліся не дапускаць на сваіх тэр. варожай польскай агітацыі. Даверны пратакол да дагавора, пагадненні і дагаворы ад 16.11.1939, 10.6.1940, 31.8.1940 і 10.1.1941 рэгулявалі памежныя адносіны (у т.л. прававыя), узаемныя перасяленні немцаў з СССР і беларусаў, літоўцаў, украінцаў з вобласці дзярж. інтарэсаў Германіі (тэр. Польшчы). Дагавор, як і папярэдні пакт аб ненападзе ад 23.8.1939, быў палітычна памылковым, супярэчным нормам міжнар. права. Гэта і юрыд. несапраўднасць абодвух дагавораў канстатаваў II з'езд нар. дэпутатаў СССР (пастанова ад 24.12.1989). Дагавор 1955 аб адносінах паміж СССР і ГДР, падпісаны 20 вер. ў Маскве на нявэўны тэрмін. Абумовіў, што сав. войскі, часова размешчаныя на тэр. ГДР са згоды яе ўрада, не ўмешваюцца ва ўнутр. справы і грамадска-паліт. жыццё краіны. Дагавор 1957 аб гандлі і мараплаванні (падпісаны 27 вер. ў Берліне на нявэўны тэрмін), Пагадненне 1958 па агульных пытаннях гандлю і мараплавання (падпісана 25 крас. ў Боне), Пагадненне 1973 аб развіцці эканам., прамысл. і тэхнічнага супрацоўніцтва (падпісана 19 мая ў Боне на 10 гадоў), Пагадненне 1978 аб развіцці і паглыбленні доўгатэрміновага супрацоўніцтва СССР і ФРГ у галіне эканомікі і прамысловасці (падпісана 6 мая ў Боне на 25 гадоў) і інш. рэгулявалі пытанні эканам. супрацоўніцтва СССР з ГДР (першы дагавор) і ФРГ (астатнія пагадненні). Дагавор 1964 аб дружбе, узаемнай дапамозе і супрацоўніцтве (падпісаны 12 чэрв. ў Маскве на 20 гадоў), Дагавор 1975 аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе (падпісаны 7 кастр. ў Маскве на 25 гадоў), Пагадненне 1978 аб культурным і навуковым супрацоўніцтве (падпісана 12 мая ў Берліне на 10 гадоў), Дагавор 1970 (Маскоўскі дагавор; падпісаны 12 жн. ў Маскве), Пагадненне 1973 аб культурным супрацоўніцтве (падпісана 19 мая ў Боне на 5 гадоў) і інш. рэгулявалі пытанні знешнепаліт. і гуманіт. супрацоўніцтва СССР з ГДР (першыя 2 дагаворы і пагадненне) і ФРГ (дагавор 1970 і пагадненне 1973).

Літ.: Трухнов Г.М. Поучительные уроки истории: Три сов.-герм. договора (1922—1926 гг.). Мн., 1979; Павлов Я.С. Советско-германские договоры 1939—1941 гг.: трагедия тайных сделок. Мн., 1996.

У.Е.Снапкоўскі (дагавор ад 28.9.1939), *У.Я.Калаткоў.*

САВЕ́ЦКАЕ ПЛАТО́, ледавіковае плато, найбольш высокая ч. паверхні ў цэнтр. ч. Усх. Антарктыды. Даўж. каля 2 тыс. км, шыр. каля 450 км. Выш. ад 3000 м на перыферыі да 4000 м і больш у цэнтры, дзе размешчаны падлёдныя горы Гамбурцава. Тоўшча ледавіковага покрыва ад 750 да 3800 м. Самая халодная ч. Антарктыды, з вельмі нізкім атм. ціскам: сярэднегадавая т-ра ніжэй за -56 °С; сярэдняя т-ра ліп. ніжэй за -72 °С, на станцыі «Усход» адзначаны абс. мінімум т-ры на Зямлі -89,2 °С. Адкрыта ў 1957—58 сав. антарктычнай экспедыцыяй. Дзейнічае навук. станцыя «Усход» з 1957.

САВЕ́ЦКА-ІНДЫ́ЙСКІЯ ПАГАДНЕ́ННІ. Гандлёвае пагадненне 1953, падпісана 2 снеж. ў Маскве. Прадугледжвала развіццё і пашырэнне сав.-інд. гандлю на аснове роўнасці і ўзаемнай карысці, устанаўлівала рэжым узаемнага найб. спрыяння ў гандлі, усталявала парадак узаемных разлікаў (у інд. рупіях). Заклала асновы цеснага супрацоўніцтва СССР і Індыі ў эканам. галінах. Пагадненне 1960 пра

культурнае, навуковае і тэхнічнае супрацоўніцтва, падпісана 12 лют. ў Дэлі. Пашырала сав.-інд. супрацоўніцтва на сферы навукі і культуры. Дагавор 1971 аб міры, дружбе і супрацоўніцтве, падпісаны 9 жн. ў Дэлі. Паводле яго кожны бок абавязваўся паважаць незалежнасць, суверэнітэт і тэр. цэласнасць адзін аднаго, падтрымліваць рэгулярныя кантакты па важных міжнар. праблемах, якія закраналі іх інтарэсы, не ўдзельнічаць у ваен. саюзах, накіраваных супраць аднаго з бакоў. Дагавор пацвердзіў імкненне бакоў да ўмацавання і пашырэння супрацоўніцтва ў галінах транспарту, гандлю, эканомікі, навукі, тэхнікі, развіцця кантактаў у сферах культуры, адукацыі, аховы здароўя і інш.

САВЕ́ЦКА-КІТА́ЙСКІ КАНФЛІ́КТ 1929, канфлікт з-за *Кітайскай Чанчуньскай чыгункі* (КЧЧ). Паводле сав.-кіт. пагаднення 1924 (гл. *Савецка-кітайскія пагадненні*) КЧЧ знаходзілася ў сумесным валоданні СССР і Кітая, але фактычна кіравалася сав. бокам. Пасля пашырэння ўлады Нац. кіт. ўрада ў Нанкіне да 1929 на тэр. Маньчжурыі (гл. *Рэвалюцыя 1925—28 у Кітаі*) ён запатрабаваў усталявання над КЧЧ кіт. суверэнітэту, лічачы гэта часткай барацьбы Кітая супраць няроўных дагавораў і пагадненняў. 10—11 ліп. войскі ваен. правіцеля Маньчжурыі маршала Чжан Сюэляна ў аднабаковым парадку захапілі КЧЧ, адхіліўшы ад працы сав. работнікаў. У адказ урад СССР разарваў дыпламат. адносіны з Кітаем. 6 жн. была створана Асобая Далёкаўсх. армія (АДУА) на чале з В.К.*Блюхерам*. 17 ліст. часці АДУА на чале з С.С.Вастрацовым перайшлі сав.-кіт. граніцу ў раёне станцыі Маньчжурыя. У 3-дзённых баях яны разбілі 2 брыгады кіт. арміі (20 тыс. чал.), узяўшы ў палон больш як палавіну іх асабовага складу. У баявых дзеяннях на р. Сунгары ўдзельнічала Амурская ваен. флатылія, якая разграміла Сунгарыйскую флатылію праціўніка. 21 ліст. кіт. бок прапанаваў пачаць перагаворы. 3 снеж. быў падпісаны пратакол у Нікольску-Усурыйскім з прадстаўнікамі Чжан Сюэляна, а 22 снеж. — у Хабараўску з прадстаўнікамі Нац. кіт. ўрада пра аднаўленне на КЧЧ статус-кво. Канчаткова канфлікт урэгуляваны з аднаўленнем сав.-кіт. дыпламат. адносін у 1932.

Літ.: Кулагин В.М., Яковлев Н.Н. Подвиг Особой Дальневосточной. М., 1970; Конфликт на КВЖД: Из истории Сов. Вооруж. сил. Хабаровск, 1989.

САВЕ́ЦКА-КІТА́ЙСКІ КАНФЛІ́КТ 1969, узброены канфлікт паміж СССР і Кітаем у выніку пагаршэння сав.-кіт. адносін у 1960-я г. і нявырашанага пагранічнага пытання. Кіт. бок патрабаваў перагляду рас.-кіт. дагавораў 19 ст. (гл. *Айгунскі дагавор 1858, Пекінскі трактат 1860*), каб граніца паміж дзвюма краінамі праходзіла па найб. глыбінях рэк Амур і Усуры. У 1950-я г. адпаведныя сав.-кіт. камісіі правялі работу па ўрэгуляванні гэтага пытання і вызначэнні новай граніцы, але з пагаршэннем сав.-кіт. адносін працэс быў спынены. Адначасова кіт. бок пачаў ва ультыматыўнай форме патрабаваць вырашэння пагранічнага пытання, на сав.-кіт. граніцы ім былі арганізаваны правакацыйныя акцыі *хунвэйбінаў* і шматлікія парушэнні кіт. пагранічнікамі. 2.3.1969 кіт. ваеннаслужачыя расстралялі на в-ве Даманскі на р. Усуры сав. пагранічны нарад. 14—15 сак. тут адбыліся баі паміж сав. і кіт. войскамі з выкарыстаннем артылерыі і ракетных установак; усяго ў выніку канфлікту на Даманскім загінула 58 сав. ваеннаслужачых. 13 жн. некалькі груп кіт. ваеннаслужачых парушылі сав. граніцу ў раёне Жаланашколя (Казахстан). У выніку іх сутыкнення з сав. войскамі былі забітыя і параненыя. Сітуацыю разрадзілі перагаворы 11 вер. ў Пекіне старшынь урадаў СССР і Кітая — А.М.*Касыгіна* і *Чжоў Эньлая*. Перагаворы па вырашэнні пагранічных пытанняў пачаліся 20 кастрычніка. Канчаткова гэта праблема была ўрэгулявана ў 1990-я г. пасля вызначэння б.ч. рас.-кіт. граніцы.

САВЕ́ЦКА-КІТА́ЙСКІЯ ПАГАДНЕ́ННІ. Пагадненне 1924 аб агульных прынцыпах для ўрэгулявання пытанняў паміж СССР і Кітайскай Рэспублікай, падпісана 31 мая ў Пекіне. Усталёвала паміж дзвюма краінамі дыпламат. адносіны. Абвяшчала скасаванымі ўсе дагаворы Рас. імперыі з інш. краінамі, якія закраналі інтарэсы Кітая. Бакі абавязаліся не заключаць ніякіх дагавораў або пагадненняў, якія б закраналі інтарэсы аднаго з бакоў, не весці прапаганду адзін супраць аднаго і не дазваляць дзейнічаць на сваёй тэрыторыі арг-цыям, якія гвалтоўнымі метадамі змагаюцца супраць урада інш. боку. СССР адмовіўся ад усіх аднабаковых прывілеяў для сваіх грамадзян (права экстэрытарыяльнасці і консульскай юрысдыкцыі) і ад рас. часткі т.зв. «баксёрскай кантрыбуцыі» (гл. *Іхэтуаньскае паўстанне*). *Кітайская Чанчуньская чыгунка* (КЧЧ) пераходзіла пад сумеснае кіраванне СССР і Кітая. СССР прызнаваў *Манголію Знешнюю* неад'емнай ч. Кітая. Дагавор 1937 аб ненападзе, падпісаны 21 жн. ў Нанкіне тэрмінам на 5 гадоў. Паводле яго бакі абавязаліся не нападаць адзін на аднаго, не аказваць ні прамой, ні ўскоснай падтрымкі дзяржаве або дзяржавам, якія здзейснілі напад на адзін з бакоў, і на працягу канфлікту пазбягаць усялякіх дзеянняў, якія б маглі пагоршыць становішча боку, на які напалі. Садзейнічаў усталяванню цесных сувязей паміж СССР і Кітаем, што спрыяла барацьбе апошняга з яп. агрэсіяй (гл. *Нацыянальна-вызваленчая вайна кітайскага народа супраць японскіх захопнікаў 1937—45*). Дагавор 1945 аб дружбе і саюзе, падпісаны 14 жн. ў Маскве. Прадугледжваў аказанне ўзаемнай дапамогі ў вайне супраць Японіі. Бакі абавязаліся супрацоўнічаць пасля заканчэння вайны, аказваць адзін аднаму эканам. дапамогу пры захаванні прынцыпу ўзаемнай павагі суверэнітэту і тэр. цэласнасці. Адначасова з дагаворам былі падпісаны пагадненні, якія прадугледжвалі сумесную эксплуатацыю КЧЧ як агульнай маёмасці. Порт-Артур перадаваўся ў карыстанне СССР як ваен. база. Фактычна страціў сілу пасля перамогі кіт. камуністаў у грамадз. вайне і абвяшчэння імі ў 1949 Кіт. Нар. Рэспублікі (КНР). Дагавор 1950 аб міры, дружбе, саюзе і ўзаемнай дапамозе, падпісаны 14 лют. ў Маскве. Першы з дагавораў паміж СССР і КНР. Бакі абавязаліся прыняць усе неабходныя меры для прадухілення агрэсіі з боку Японіі, а ў выпадку нападу на адзін з бакоў аказваць усю магчымую дапамогу; пагадзіліся дабівацца заключэння мірнага дагавора з Японіяй у магчыма кароткі тэрмін. Сав. ўрад абавязаўся не пазней як у канцы 1952 перадаць КНР свае правы на КЧЧ, вывесці свае войскі з Порт-Артура. СССР даваў КНР грашовы крэдыт. Заключаны тэрмінам на 30 гадоў, з 1980 фармальна страціў сілу.

САВЕ́ЦКА-ЛАТВІ́ЙСКІЯ ДАГАВО́РЫ. Мірны дагавор 1920, падпісаны 11 жн. ў Рызе. Сав. Расія прызнавала незалежнасць і суверэннасць Латвіі, вяртала ёй дзярж. маёмасць, вывезеную ў Расію ў 1-ю сусв. вайну, вызваляла ад адказнасці па пазыках і інш. абавязацельствах, выплачвала 4 млн. руб. золатам. Дзяржавы абавязаліся не трымаць на сваіх тэрыторыях войск, якія знаходзіліся ў стане вайны з другім бокам, варожых арг-цый і груп. Дагавор вызначаў сав.-латв. граніцу, дыпламат. і консульскія адносіны; меў вял. значэнне для прарыву блакады, арганізаванай Антантай вакол Сав. Расіі. Дагавор 1932 аб ненападзе і мірным вырашэнні канфліктаў, падпісаны 5 лют. ў Рызе тэрмінам на 3 гады. СССР і Латвія абавязаліся ўстрымлівацца ад нападаў, не ўдзельнічаць у пагадненнях, накіраваных супраць другога боку. Пратаколам ад 4.4.1934 дагавор прадоўжаны да 1945. Пакт аб узаемадапамозе 1939, падпісаны 5 кастр. ў Маскве. Сав. ўрад, маючы на ўвазе стратэг. значэнне Прыбалтыкі ў сістэме бяспекі СССР і ў сувязі з заключэннем *Пакта Рыбентропа—Молатава 1939*, а таксама сакрэтных пратаколаў да яго прапанаваў ураду Латвіі заключыць дагавор аб узаемадапамозе. Бакі абавязаліся не ўдзельнічаць у саюзах і кааліцыях, накіраваных супраць аднаго з іх, узаемна дапамагаць, у т.л. і ў выпадку ваен. нападу ці пагрозы з боку інш. дзяржавы. Латвія дала СССР права мець на яе тэрыторыі ваен.-марскія, авіяц. і артыл. базы. Сав. войскі садзейнічалі стварэнню ўмоў для змены

дзярж. ладу і ўключэння Латвіі ў склад СССР.

Літ.: Полпреды сообщают...: Сб. док. об отношениях СССР с Латвией, Литвой и Эстонией, авг. 1939 г. — авг. 1940 г. М., 1990.

САВЕ́ЦКА-ЛІТО́ЎСКІЯ ДАГАВО́РЫ. Мірны дагавор 1920 паміж РСФСР і Літвой, падпісаны 12 ліп. ў Маскве. Адзін з першых дагавораў Сав. Расіі, пачатак устанаўлення мірных адносін з прыбалт. краінамі. Дагавор зафіксаваў сав.-літ. граніцу, прадугледжваў урэгуляванне маёмасных, фін. і эканам. пытанняў, устанаўленне дыпламат. і гандл. адносін. РСФСР прызнала незалежнасць Літвы, яе права на Вільню і Віленскую вобл. Краіны абавязаліся не дапускаць, каб на іх тэр. ствараліся і знаходзіліся арганізацыі і групы, накіраваныя супраць другога боку. Дагавор 1926 паміж СССР і Літ. рэспублікай аб узаемным ненападзе і нейтралітэце, падпісаны 28 вер. ў Маскве. Пацвердзіў, што асновай адносін паміж абедзвюма краінамі з'яўляецца дагавор ад 12.7.1920. Бакі абавязаліся паважаць суверэнітэт, тэр. цэласнасць і недатыкальнасць дзяржаў, устрымлівацца ад агрэсіўных дзеянняў, не ўдзельнічаць у варожых адна адной кааліцыях, прытрымлівацца нейтралітэту ў выпадку нападу на адзін з бакоў. Дагавор 1939 аб перадачы Літ. рэспублікі Вільні і Віленскай вобл. і ўзаемадапамозе паміж СССР і Літвой, падпісаны 10 кастр. ў Маскве. Звязаны з падпісаннем *пакта Рыбентропа—Молатава 1939* і зменай міжнар. адносін пасля пачатку 2-й сусв. вайны. Урад СССР перадаў Літве Вільню і Віленскую вобл. СССР і Літва дамовіліся аб сумеснай ахове літ. граніц, на тэр. Літвы ўведзены сав. войскі, што садзейнічала ўмацаванню паўн.-зах. граніц СССР, абумовіла змену дзярж. ладу ў Літве і ўключэнне яе ў склад СССР.

Публ.: Мирный договор между Россией и Литвой, 12 июля 1920 г. Вильнюс, 1990.

Літ.: Полпреды сообщают...: Сб. док. об отношениях СССР с Латвией, Литвой и Эстонией, авг. 1939 г. — авг. 1940 г. М., 1990; Іваноў М. Праблема прыналежнасці Вільні і беларускае нацыянальнае пытанне ў 1939 г. // Бел. гіст. часоп. 1994. № 1.

САВЕ́ЦКА-МАНГО́ЛЬСКІЯ ПАГАДНЕ́ННІ. Пагадненне 1921 аб усталяванні дружалюбных адносін паміж РСФСР і Манголіяй, падпісана 5 ліст. ў Маскве. Паводле яго абодва бакі дамовіліся аб усталяванні дыпламат. адносін. Сав. бок адмовіўся ад усіх аднабаковых прывілеяў для сваіх грамадзян на тэр. Манголіі, перадаў Манголіі ўсю рас. маёмасць там. Пагадненне заклала асновы цеснага супрацоўніцтва СССР і Манголіі, ператварэнне апошняй ў фактычную сферу сав. ўплыву, нягледзячы на тое, што ў 1924 СССР фармальна прызнаў Манголію ч. Кітая (гл. *Савецка-кітайскія пагадненні*). Пратакол 1936 аб узаемнай дапамозе, падпісаны 12 сак. ва Улан-Батары. Юрыдычна аформіў вуснае (джэнтльменскае) пагадненне ад 27.12.1934. Паводле яго ў выпадку пагрозы нападу на тэр. СССР або Манголіі з боку трэцяй дзяржавы абодва бакі абавязаліся прыняць меры для сваёй бяспекі, у выпадку ж ваен. нападу на адзін з бакоў — аказаць адзін аднаму ўсялякую, у т.л. ваен., дапамогу. Дагавор стаў абгрунтаваннем для ўдзелу сав. войск у *Халхін-Гольскім канфлікце 1939*. Дагавор 1946 аб дружбе і ўзаемнай дапамозе, падпісаны 27 лют. ў Маскве. У цэлым паўтараў тэкст дагавора 1936. Дагавор 1966 аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе, падпісаны 15 студз. ва Улан-Батары. Бакі абавязаліся ўмацоўваць дружбу і развіваць супрацоўніцтва ва ўсіх галінах эканам., культурнага, навук. жыцця, пашыраць сувязі ў сферах аховы здароўя, адукацыі і інш. Дагавор пацвярджаў і замацоўваў саюзніцкія адносіны паміж дзвюма краінамі.

САВЕ́ЦКА-ПО́ЛЬСКАЕ ПАГАДНЕ́ННЕ 1941, пагадненне Сікорскага — Майскага, падпісана 30 ліп. ў Лондане ў 2-ю сусв. вайну паслом СССР у Вялікабрытаніі І.М.Майскім і кіраўніком *польскага ўрада ў эміграцыі* ген. У.*Сікорскім*. Спыніла польска-сав. канфлікт, які пачаўся пасля ўступлення 17.9.1939 Чырв. Арміі ва Усх. Польшчу (Зах. Беларусь і Зах. Украіну) у пач. 2-й сусв. вайны, калі Польшча абаранялася ад нападу фаш. Германіі. Урад Сікорскага з ліст. 1939 лічыў Польшчу ў стане вайны з СССР, да нападу Германіі на СССР (22.6.1941) афіц. польска-сав. кантакты адсутнічалі. Перагаворы пачаліся 5.7.1941 у Лондане пры пасрэдніцтве міністра замежных спраў Вялікабрытаніі Э.*Ідэна*. Яны выявілі рознагалоссі бакоў адносна міждзярж. граніцы. Але пад націскам брыт. ўрада, зацікаўленага ў супрацоўніцтве з СССР у барацьбе з Германіяй, Сікорскі згадзіўся на кампрамісны тэкст пагаднення, не закранаючы ў ім пытання аб граніцы. Пагадненне складалася з 5 пунктаў: сав.-герм. дагаворы 1939, што датычыліся тэр. змен у Польшчы, прызнаваліся страціўшымі сілу; аднаўляліся двухбаковыя дыпламат. адносіны; прадугледжвалася ўзаемная дапамога ў вайне супраць Германіі; урад СССР даваў згоду на стварэнне на сваёй тэр. польскай арміі; прадугледжвалася неадкладнае, без ратыфікацыі, уступленне пагаднення ў сілу. 14.8.1941 у Маскве падпісаны спец. ваенны дагавор, які рэгуляваў пытанні стварэння польскай арміі. Да вясны 1942 у СССР сфарміравана польская *Андэрса армія*. С.-п.п. 1941 страціла сілу ў момант разрыву ўрадам СССР адносін з польскім урадам (25.4.1943) у адказ на патрабаванне апошняга высветліць абставіны Катыньскага расстрэлу 1940 (гл. *Катынь*).

Літ.: Документы и материалы по истории советско-польских отношений. М., 1973. Т. 7. С. 198, 201—202, 207—208, 217—218; Układ Sikorski—Majski: Wybór dokumentów. Warszawa, 1990. *Р.Р.Лазько, Е.Ф.Саўчук.*

САВЕ́ЦКА-ПО́ЛЬСКАЯ ВАЙНА́ 1920, вайна сав. дзяржавы з Польшчай у крас.— кастр. 1920; частка польска-сав. вайны 1919—20, выкліканай экспансіяй Польшчы пры падтрымцы яе дзяржавамі Антанты і ЗША. У перыяд адраджэння польск. дзяржавы (канец 1918 — пач. 1919) краіны Антанты і ЗША, зацікаўленыя выкарыстаць яе ў барацьбе супраць сав. рэспублік — РСФСР, *Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі* (Літбел) і УССР, падтрымлівалі заваёўніцкія планы кіруючых польск. колаў. Пры іх падтрымцы польск. армія была даведзена да 545 тыс. чал. У 1-й пал. 1919 Польшча атрымала ад ЗША на 60 млн. дол. зброі і на 51,6 млн. дол. харчавання. Значнымі былі ваен. пастаўкі з Францыі, на яе тэр. было сфарміравана 5 польскіх дывізій. У пач. 1919 польск. камандаванне стала канцэнтраваць свае войскі каля граніц сав. рэспублік. На сав. прапановы аб перамір'і польскі ўрад не адказаў. Ён выступіў супраць устанаўлення сав. улады ў Беларусі і Літве, не прызнаў абвяшчэння суверэннай *Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі* (БССР), а потым і стварэння Літбела. У 1-й пал. лют. 1919 Польшча пачала ваен. дзеянні супраць сав. рэспублік. Паўн. група польск. войск наступала ў напрамку Вільні і Ліда—Маладзечна, паўд. — на Баранавічы—Мінск і Кобрын—Пінск; разгортваліся ваен. дзеянні і на тэр. Украіны. Для адпору інтэрвенцыі ў лют. 1919 створаны сав. *Заходні фронт 1919—24*. 8.4.1919 Літбел аб'яўлена на ваен. становішчы, але спыніць польск. войскі не ўдалося. Урады РСФСР і Літбела звярталіся да польск. ўрада з прапановамі мірна вырашыць спрэчныя пытанні, але польскі бок адхіліў іх. 22.4.1919 захоплена сталіца Літ.-Бел. ССР Вільня. У гэты перыяд у польск. друку і грамадскай думцы адносна Беларусі вызначыліся 2 тэндэнцыі. Адна выражала інтарэсы кіруючых колаў: далучыць землі былога ВКЛ (Беларусь і Літву) да Польшчы. Другая адлюстроўвала думку польскіх дэмакр. сіл, якія разглядалі Беларусь, Літву і Украіну як самаст. дзяржавы, звязаныя з Польшчай уніяй (т.зв. «федэралістычная канцэпцыя»). З ёй спачатку вымушана лічыўся і нач. польскай дзяржавы Ю.*Пілсудскі*.

Але неўзабаве ён ад яе адмовіўся. Віленская дэкларацыя (прынята польск. сеймам 2.5.1919) нават сцвярджала, што «бацькаўшчына Касцюшкі, Міцкевіча і Траўгута належыць да Польшчы, як частка непадзельная». Фактычна Пілсудскі адмовіўся ад «федэралістычнай канцэпцыі і ўзяў на ўзбраенне іншы план — захапіць Літву з Вільняй, Беларусь з Мінскам, Украіну з Кіевам». Сутнасць палітыкі Польшчы адносна Беларусі была выкладзена ў памятнай запісцы кіраўніцтва «*Стражы крэсовай*» — далучэнне да Польшчы «крэсаў усходніх» (бел., літ. і ўкр. зямель). У сак.— крас. 1919 польскія войскі занялі Брэст, Ваўкавыск, Слонім, Скідзель, Шчучын,

Пінск, Баранавічы. Урад РСФСР заявіў пратэст ураду Польшчы і прапанаваў мірна ўрэгуляваць усе спрэчныя пытанні. Важнае значэнне мелі пастановы ЦВК Украіны, Літвы і Беларусі (прыняты ў маі 1919) аб неабходнасці заключэння ваен.-паліт. саюзу. На іх аснове ЦВК Расіі прыняў 1.6.1919 пастанову аб аб'яднанні ваен. сіл сав. рэспублік. Але праціўнік меў значную перавагу (яго сілы амаль падвоіліся, калі з Францыі была перакінута добра ўзбр. армія). 1.7.1919 польск. войскі разгарнулі наступленне на Зах. фронце, а 8 жн. занялі Мінск. У сярэдзіне жніўня яны занялі практычна ўсю тэр. Літ.-Бел. ССР і шэраг раёнаў Украіны.

У Беларусі лінія фронту праходзіла па р. Бярэзіна, на Украіне — па р. Славечна — г. Наваград-Валынскі — г. Магілёў-Падольскі. Польскі ўрад адхіліў чарговыя мірныя прапановы сав. ўрада (22.12.1919, 28.1 і 2.2.1920). 25.4.1920 войскі Польшчы (агульная колькасць узбр. сіл 740 тыс. чал.) пачалі наступаць: у Беларусі — 1-я, 4-я, 7-я арміі (79 тыс. штыкоў і шабляў, камандуючы ген. С.Шаптыцкі); на Украіне — 2-я, 3-я, 6-я (65 тыс. штыкоў і шабляў, камандуючы Пілсудскі). У Беларусі ім процістаялі войскі Зах. фронту [180 тыс. штыкоў і шабляў, камандуючыя У.М.*Гіціс* (з 7.7.1919), М.М.*Тухачэўскі* (з 29.4.1920)]; на Украіне — войскі Паўд.-Зах. фронту [120 тыс. штыкоў і шабляў, камандуючы А.І.*Ягораў* (10.1—31.12.1920), чл. РВС: Р.І.Берзін (10.1—18.12.1920), Х.Г.Ракоўскі (6.2—9.10.1920), І.В.Сталін (10.1—1.9.1920), С.І.Гусеў (29.8—14.10.1920), С.І.Аралаў (1—31.12.1920)]. У сак. 1920 польскія войскі занялі Мазыр, Калінкавічы, Оўруч, перарэзалі чыгункі паміж Зах. і Паўд.-Зах. франтамі; у крас. 1920 пры падтрымцы ўкр. палкоў С.*Пятлюры* захапілі Корасцень, Жытомір, Казацін, 6 мая — Кіеў (гл. *Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя 1918—22*).

12.5.1920 у сав. дзяржаве абвешчана ваен. становішча, у тэзісах «Польскі фронт і нашы задачы» (апубл. 23.5.1920) ЦК РКП(б) заклікаў працоўных на барацьбу з інтэрвентамі, на польскі фронт накіравана больш за 24 тыс. камуністаў. З Беларусі па парт. мабілізацыі на Зах. фронт з 1.1 да 1.10.1920 накіравана 1116 камуністаў. Паводле няпоўных звестак у дзеючых часцях Чырв. Арміі ў перыяд вайны было больш за 100 тыс. ураджэнцаў Беларусі. У Беларусі фарміравалася Запасная армія Зах. фронту, якая ў маі 1920 мела да 40 тыс. чал. (камандуючы П.А.Пятраеў). 13 курсаў і школ рыхтавалі камандзіраў Чырв. Арміі. 28.4.1920 Палітбюро ЦК РКП(б) ухваліла план наступлення, распрацаваны Гал. камандаваннем Чырв. Арміі. Гал. ўдар наносіў Зах. фронт праз Беларусь на Варшаву; часці Паўд.-Зах. фронту пасля вызвалення Кіева павінны былі наступаць праз Роўна на Брэст. На ўмацаванне Зах. фронту накіраваны 10-я стралк. і 2-я кав. дывізіі, на Паўд.-Зах. — 1-я Конная армія (камандуючы С.М.*Будзённы*) і 25-я стралк. дывізія. 14.5.1920, не дачакаўшыся рэзерваў, Зах. фронт пачаў наступаць. 16-я армія фарсіравала Бярэзіну паміж прытокамі Бобр і Клява і наступала ў напрамку Мінска. Польск. камандаванне падцягнула рэзервы з літ. граніцы і контрударам прымусіла сав. войскі адысці на выходныя рубяжы. Наступленне польск. войск на Украіне было затрымана. Паўд.-Зах. фронт, падмацаваны 1-й Коннай арміяй, нанёс паражэнне 3-й і 6-й польск. арміям і 12.6.1920 вызваліў Кіеў.

Летам 1920 на Зах. фронце было больш за 100 тыс. чал., 2573 кулямёты, 598 гармат. 4.7.1920 ударная група фронту (3-і кав. корпус Г.Дз.*Гая*, 4-я, 15-я і 3-я арміі) разбіла польск. войскі каля Полацка і рушыла да Вільні і Маладзечна, 16-я армія фарсіравала Бярэзіну і 11.7.1920 вызваліла Мінск. Мазырская група (57-я стралк. дывізія і зводны атрад) наступала ўздоўж чыгункі Мазыр—Брэст. 14 ліпеня войскі Зах. фронту занялі Вільню, 19 ліп. фарсіравалі Нёман, Шчару і выйшлі на тэр. Польшчы (гл. *Майская аперацыя 1920, Ліпеньская аперацыя 1920*). На Украіне Чырв. Армія разбіла польск. войскі пад Роўнам, 11 ліп. заняла Сарны, Роўна, Камянец-Падольскі. У канцы ліп. ў Беластоку створаны *Польскі рэвалюцыйны камітэт* (Польрэўком). У сав. тыле фарміравалася 1-я Польская Чырв. Армія, якая на восень 1920 мела 22 вайск. часці (2507 чал.). Да сярэдзіны жн. 1920 сав. войскі падышлі да Варшавы і Львова. Але стомленасць войск, іх адарванасць ад баз забеспячэння далі магчымасць польск. арміі, якой дапамагала зброяй Антанта, прыпыніць наступленне Чырв. Арміі ў *Варшаўскай аперацыі 1920* і прымусіць яе адысці.

Паражэнне Чырв. Арміі ў Варшаўскай аперацыі было абумоўлена найперш пераацэнкай гатоўнасці рабочых і сялян Польшчы падтрымаць наступленне сав. войск (ідэя сусв. сацыяліст. рэвалюцыі). Абмежаваныя матэрыяльныя рэсурсы сав. краіны не далі магчымасці забяспечыць усім неабходным войскі фронту. Сав. камандаванне зрабіла стратэгічныя і тактычныя памылкі. Недастатковая ўвага аддавалася аператыўнаму забеспячэнню баявых дзеянняў. Змена камандаваннем Паўд.-Зах. фронту напрамку гал. ўдару з Брэсцкага на Львоўскі парушыла ўзаемадзеянне франтоў, што і прадвызначыла канчатковы вынік аперацыі. Да таго ж Чырв. Армія была вымушана весці баявыя дзеянні на інш. франтах. У сувязі з гэтым польскія войскі выкарысталі ініцыятыву і ў вер.—кастр. 1920 прасуніліся на У, захапіўшы Мінск. Крыху пазней яны зноў адступілі. 12.10.1920 у Рызе падпісаны дагавор аб перамір'і і прэлімінарных умовах міру, а 18.3.1921 — *Рыжскі мірны дагавор 1921*, паводле якога ў складзе Польшчы засталіся занятыя яе войскамі *Заходняя Беларусь* і *Заходняя Украіна*. У час вайны ў баявых дзеяннях удзельнічалі таксама савецкія *Дняпроўская ваенная флатылія, Заходнядзвінская ваенная флатылія, Прыпяцкая ваенная флатылія* і польская Пінская флатылія (гл. ў арт. *Пінская ваенная флатылія*).

Літ.: Директивы Главного командования Красной Армии (1917—1920 гг.): Сб. док. М., 1969; Сташкевич Н.С. Приговор революции: Крушение антисов. движения в Белоруссии, 1917—1925. Мн., 1985; Польско-советская война, 1919—1920: (Ранее не опубл. док. и материалы). Ч. 1—2. М., 1994; Маль К. Вайна 1920 г. і Беларусь: Вызваленне ці акупацыя? // Бел. гіст. агляд. 1997. Т. 4, сш. 1—2 (6—7); Круталевич В.А. История Беларуси: становление нац. державности (1917—1922 гг.). Мн., 1999. *М.С.Сташкевіч.*

САВЕ́ЦКА-ПО́ЛЬСКІ ДАГАВО́Р 1945, Дагавор аб савецка-польскай дзяржаўнай граніцы паміж СССР і Польшчай, падпісаны 16.8.1945 у Маскве нам. Старшыні СНК СССР В.М.Молатавым і Старшынёй СМ Польскай Рэспублікі Э.Асубка-Мараўскім замест пагаднення ад 26.7.1944 паміж урадам СССР і *Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення*. Заключаны ў адпаведнасці з сав.-польск. дагаворам ад 21.4.1945 (гл. *Савецка-польскія дагаворы і пагадненні*). Вызначыў дзярж. граніцу паміж СССР і Польшчай згодна з рашэннямі *Крымскай канферэнцыі 1945* уздоўж *«Керзана лініі»* з адхіленнямі ад яе на карысць Польшчы ў некат. раёнах на 5—8 км. Пры гэтым Польшчы дадаткова ўступаліся землі на У ад «Керзана лініі» да рэк Зах. Буг і Салокія, на Пд ад г. Крылаў з водступам на карысць Польшчы максімальна на 30 км (тэр. Украіны); частка Белавежскай пушчы на ўчастку Няміраў—Ялаўка на У ад «Керзана лініі», уключаючы Няміраў, Гайнаўку, Белавежу і Ялаўку, з водступам на карысць Польшчы максімальна на 17 км (тэр. Беларусі). Усяго ад БССР адыходзілі 17 раёнаў *Беластоцкай вобласці* з г. Беласток і 3 раёны Брэсцкай вобл. (частка Белавежскай пушчы) — тэр. плошчай 14,3 тыс. км^2 з прыбл. 638 тыс. жыхароў (паводле польск. перапісу 1946), сярод якіх было 61% католікаў, 23% праваслаўных, 15% іудзеяў (даныя 1921). Польшча перадавала БССР 15 вёсак, населеных пераважна беларусамі. 20.8.1945 Вярх. Савет БССР прыняў пастанову аб перадачы Польшчы б.ч. зямель Беластоцкай вобл. Дагавор ратыфікаваны *Краёвай Радай Нарадовай* 31.12.1945 і Прэзідыумам Вярх. Савета СССР 13.1.1946. Ён прадугледжваў таксама стварэнне змешанай камісіі па дэмаркацыі граніцы (знаходзілася ў Варшаве), якая працавала з мая 1946 і скончыла дэмаркацыю граніцы ў крас. 1947. У 1946—55 граніца паміж БССР і Польшчай па рашэнні сав. ўрада 4 разы адсоўвалася на У. Польшчы былі перададзены некалькі дзесяткаў вёсак Сапоцкінскага, Беластоцкага і Свісцкага р-наў, жыхары якіх былі пераважна католікамі. Падрыхтоўка, падпісанне і ратыфікацыя дагавора ажыццяўляліся без удзелу прадстаўнікоў БССР. Ён не абмяркоўваўся ў вышэйшых органах

дзярж. улады Беларусі, чые нац.-дзярж. інтарэсы непасрэдна закранаў. Дагавор парушаў палажэнні Канстытуцыі СССР 1936 і Канстытуцыі БССР 1937, што патрабавалі згоды саюзнай рэспублікі на змену яе граніц. З пункту гледжання міжнар. права дагавор быў чарговым падзелам тэр. Беларусі, якая паводле рашэнняў *Сан-Францыскай канферэнцыі 1945* уваходзіла ў склад дзяржаў — заснавальніц ААН. Разам з тым паводле дагавора аб добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча ад 23.6.1992 бакі пацвердзілі існуючую паміж імі граніцу, вызначаную дагаворам ад 16.8.1945.

Літ.: Волаціч М. Насельніцтва Заходняй Беларусі і яго перасяленьне між сучаснай Польшчай і БССР // Беларускі зборнік. Мюнхен, 1956. Кн. 4; Снапкоўскі У.Е. Міжнародныя аспекты вызначэння савецка-польскай мяжы ў 1943—1945 гг. // Бел. гіст. часоп. 1994. № 3; Мірановіч Я. Навейшая гісторыя Беларусі. Беласток, 1999.

У.Е.Снапкоўскі.

САВЕ́ЦКА-ПО́ЛЬСКІЯ ДАГАВО́РЫ І ПАГАДНЕ́ННІ. Мірны дагавор 1921 паміж РСФСР, УССР і Польскай Рэспублікай, падпісаны 18 сак. ў Рызе. Гл. *Рыжскі мірны дагавор 1921.* Дагавор 1932 аб ненападзе паміж СССР і Польшчай, падпісаны 25 ліп. ў Маскве на 3 гады па ініцыятыве сав. боку (перагаворы вяліся са студз. 1926, з-за рознагалоссяў бакоў перапынены і адноўлены ў канцы 1931; 26.1.1932 дагавор парафіраваны). Дзяржавы абавязваліся ўстрымлівацца ад агрэсіўных дзеянняў, у выпадку нападу на адну з іх не аказваць ні прамой, ні ўскоснай дапамогі краіне-агрэсару; не ўдзельнічаць у пагадненнях, варожых другому боку. Дагавор не пярэчыў інш. абавязацельствам, падпісаным раней, калі «гэтыя пагадненні не заключаюць у сабе элементаў агрэсіі». Паводле дагавора створана ўзгадняльная камісія з 4 чл. (па 2 ад кожнага боку). Пратаколам ад 5.5.1934 тэрмін дзеяння дагавора працягнуты да 31.12.1945. Страціў сілу пасля ўступлення 17.9.1939 Чырв. Арміі на тэр. Усх. Польшчы (Зах. Беларусь і Зах. Украіна) у пач. 2-й сусв. вайны. Пагадненне 1941 паміж урадам СССР і *польскім урадам у эміграцыі*, падпісана 30 ліп. ў Лондане. Гл. *Савецка-польскае пагадненне 1941.* Пагадненне 1944 паміж урадам СССР і *Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення* (ПКНВ) аб адносінах паміж сав. галоўнакамандуючым і польскай адміністрацыяй пасля ўступлення сав. войск на тэр. Польшчы, падпісана 26 ліп. ў Маскве. Вызначыла, што вярх. ўлада і адказнасць за ўсе справы, якія датычаць ваен. дзеянняў на тэр. Польшчы, ускладаюцца на галоўнакамандуючага сав. войскамі. ПКНВ на вызваленых польскіх землях ствараў органы польскай адміністрацыі, фарміраваў і ўкамплектоўваў польскія войскі, забяспечваў садзеянне органаў польскай адміністрацыі ў ажыццяўленні Чырв. Арміяй ваен. аперацый і ў задавальненні яе патрэб у час знаходжання на польскай тэрыторыі. Прадугледжвалася, што асобы, якія належалі да сав. войск, заставаліся ў сав. юрысдыкцыі; асобы, што належалі да Войска Польскага, і цывільнае насельніцтва падлягалі польскай юрысдыкцыі. Дагавор 1945 аб дружбе, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве, падпісаны 21 крас. ў Маскве на 20 гадоў. СССР і Польшча абавязваліся давесці вайну супраць фаш. Германіі да поўнай перамогі, не заключаць без узаемнай згоды перамір'я або мірнага дагавора з урадам А.Гітлера і інш. уладай у Германіі, якая б замахвалася на незалежнасць, тэр. цэласнасць ці бяспеку адной з дагаворных дзяржаў, пашыраць сав.-польскае эканам. і культ. супрацоўніцтва, аказваць ваен. і інш. дапамогу, пасля вайны рабіць усе захады, каб не паўтарылася агрэсія з боку Германіі ці інш. дзяржавы. Пагадненне 1945 аб абмене насельніцтвам, падпісана 6 ліп. ў Маскве. Давала права свабоднага добраахвотнага выхаду з сав. грамадзянства і вяртання ў Польшчу асобам польскай і яўр. нацыянальнасцей, якія да 17.9.1939 былі польскімі грамадзянамі, і членам іх сем'яў, а таксама права выхаду з польскага грамадзянства і перасялення ў СССР асобам рускай, укр., бел., рускай (зах. ўкраінцы, што даўней жылі ў складзе Аўстра-Венгрыі) і літоўскай нацыянальнасцей і членам іх сем'яў, якія жывуць на тэр. Польшчы. Дагавор 1945 аб савецка-польскай дзярж. граніцы, падпісаны 16 жн. ў Маскве. Гл. *Савецка-польскі дагавор 1945.* Пагадненне 1957 аб тэрмінах і парадку далейшай рэпатрыяцыі з СССР асоб польскай нацыянальнасці. Сав. ўрад выказаў гатоўнасць спрыяць добраахвотнай рэпатрыяцыі палякаў, што мелі сем'і ў Польшчы, а таксама тых, хто раней не змог выкарыстаць права на рэпатрыяцыю, сваякам рэпатрыянтаў у СССР. Дагавор 1965 аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе, падпісаны 8 крас. ў Варшаве на 20 гадоў. СССР і Польшча абавязваліся дзейнічаць у рамках папярэдняга дагавора 1945 і *Варшаўскага дагавора 1955*, супрацоўнічаць у межах Савета Эканам. Узаемадапамогі, заявілі пра недатыкальнасць дзярж. граніц Польшчы па Одэры — Нейсе. У развіццё гэтага дагавора ў 1970—85 падпісаны шэраг пагадненняў і пратаколаў па пытаннях эканомікі, гандлю, навукі, тэхнікі.

У.Е.Снапкоўскі.

САВЕ́ЦКА-ТУРЭ́ЦКІЯ ДАГАВО́РЫ. Дагавор 1921 аб дружбе і братэрстве, падпісаны 16 сак. ў Маскве. Паводле яго РСФСР адмовілася ад усіх нераўнапраўных дагавораў і пагадненняў Турцыі з Рас. імперыяй; да Турцыі адыходзілі раёны Карса, Ардахана і Артвіна; Нахічэванская вобл. ператваралася ў аўт. тэрыторыю пад пратэктаратам Азербайджана; бакі абавязаліся не дапускаць знаходжання на сваёй тэрыторыі арг-цый, якія мелі мэтай барацьбу супраць інш. боку. Дагавор меў важнае значэнне для перамогі *Кемаліскай рэвалюцыі* 1920—23. Дагавор 1925 аб дружбе і нейтралітэце, падпісаны 17 снеж. ў Парыжы. Паводле яго ў выпадку ваен. выступлення супраць аднаго з бакоў адной ці некалькіх трэціх дзяржаў інш. бок абавязваўся захоўваць нейтралітэт у адносінах да першай. СССР і Турцыя абавязаліся ўстрымлівацца ад усякага нападу на інш. бок і не прымаць удзелу ні ў якім саюзе ці пагадненні, якія накіраваны супраць інш. боку. Дэнансаваны СССР у сак. 1945.

САВЕ́ЦКА-ФІНЛЯ́НДСКАЯ ВАЙНА́ 1939—40, вайна Сав. Саюза супраць Фінляндыі 30.11.1939—12.3.1940. У сакрэтным пратаколе да *Пакта Рыбентропа—Молатава 1939* Фінляндыя была аднесена да сферы інтарэсаў СССР. Падставай для вайны стала адмова фін. ўрада адсунуць дзярж. граніцу далей ад Ленінграда (праходзіла за 32 км ад горада), за што СССР прапаноўваў Фінляндыі ўдвая большую тэр. ў Карэліі. Непасрэднай зачэпкай для пачатку ваен. дзеянняў стаў артыл. абстрэл 26.11.1939 сав. тэрыторыі каля фін. пас. Майніла (які бок вёў агонь, не высветлена), у якім СССР абвінаваціў Фінляндыю. 30.11.1939 войскі Ленінградскай ваен. акругі (каманд. камандарм 2-га рангу К.А.*Мерацкой*) пачалі наступленне. Вайна фармальна не аб'яўлялася, аднак СССР афіцыйна разарваў дыпламат. адносіны з Фінляндыяй. 1.12.1939 абвешчана пра стварэнне ў занятым Чырв. Арміяй фін. г. Тэрыёкі (цяпер Зеленагорск) нар. ўрада Фінляндскай Дэмакр. Рэспублікі на чале з О.В.*Куусіненам* (існаваў да канца вайны). Вайна працягвалася 105 дзён ва ўмовах моцных маразоў і высокага снежнага покрыва. Ваен. аперацыі адбываліся амаль на ўсім працягу сав.-фінляндскай мяжы ад Балтыйскага да Баранцава мораў. Больш паспяхова дзейнічала на Крайняй Поўначы 14-я армія (каманд. камкор В.А.Фралоў) пры падтрымцы Паўн. флоту (флагман 2-га рангу беларус В.П.*Дрозд*). Іншыя злучэнні ў пач. ваен. дзеянняў цярпелі няўдачы і неслі вял. страты. Фін. армія (галоўнакаманд. маршал К.*Манергейм*) упарта супраціўлялася. Гал. баі разгарнуліся на Карэльскім перашыйку, дзе была пабудавана моцная абарончая *«Манергейма лінія»* глыбінёй да 90 км. Дзеянні Чырв. Арміі тут падтрымліваў Балтыйскі флот (агнём артылерыі), у складзе якога дзейнічаў падшэфны карабель БССР лідэр эсмінцаў *«Мінск»*. Спроба прарваць «лінію Манергейма» з ходу поспеху не мела. 7.1.1940 створаны *Паўночна-Заходні фронт* (каманд. камандарм 1-га рангу С.К.*Цімашэнка*) у складзе 7-й (каманд. Мерацкой) і 13-й (камандарам 2-га рангу У.Д.Грэндаль) армій. На 1.2.1940 войскі Чырв. Арміі мелі 40 ды-

візій (975 675 чал.); фін. армія мела на Карэльскім перашыйку 9 дывізій і 1 кав. брыгаду (усяго больш за 300 тыс. чал.). З 11 лют. да 12 сак. 1940 войскі Чырв. Арміі прарвалі «лінію Манергейма», 12 сак. авалодалі г. Выбарг (Вііпуры). У той жа дзень у Маскве быў падпісаны мірны дагавор, паводле якога граніца на Пн ад Ленінграда адсоўвалася на лінію Выбарг— Сортавала; да СССР адышлі Карэльскі перашыек, шэраг астравоў у Фінскім заліве, невял. тэр. з г. Куалаярві і ч. п-авоў Рыбачы і Сярэдні на Баранцавым м.; Сав. Саюзу перадаваўся ў арэнду на 30 гадоў п-аў *Ханка* на Балтыйскім м. з правам стварэння на ім ваен.-марской базы. Страты Чырв. Арміі ў С.-ф.в. склалі 126 875 чал. забітымі, прапаўшымі без вестак і памерлымі ад ран і хвароб; санітарныя страты значна большыя. Паводле даных рас.-фін. даследавання «Зімовая вайна» (Кн. 1. М., 1999. С.326) у фін. палон трапіла каля 6 тыс. воінаў Чырв. Арміі, з якіх 5 572 чал. вернуты ў СССР пасля заключэння мірнага дагавора (з іх 350 чал. асуджаны на смяротнае пакаранне, 4 354 — на зняволенне ў папраўча-працоўных лагерах на тэрмін ад 5 да 8 гадоў). Страты фін. арміі склалі 66 400 чал. забітымі, прапаўшымі без вестак і параненымі, 1 100 чал. палоннымі (847 з іх вернуты ў Фінляндыю).

За баявыя заслугі каля 70 злучэнняў і часцей Чырв. Арміі ўзнагароджаны ордэнамі. Каля 50 тыс. чал. адзначаны ўзнагародамі СССР. Сярод узнагароджаных ураджэнцы Беларусі: флагман 2-га рангу Дрозд, камандзір падводнай лодкі У.С.Дзянісаў, намеснік нач. палітупраўлення Балт. флоту М.А.*Торык*, камандз. Ладажскай ваен. флатыліі П.А.Трайнін, камандзір эсмінца «Грымячы» А.І.*Гурын*, нам. каманд. войскамі Бел. асобай ваен. акругі Ф.І.*Кузняцоў*, нач. тылу Паўн.-Зах. фронту І.І.Трутко і інш. Удзельнікамі вайны былі бел. пісьменнікі К.*Крапіва*, В.*Вітка*, В.*Вольскі*, М.*Калачынскі*, М.Пянкрат. 412 удзельнікаў вайны ўдастоены звання Героя Сав. Саюза, у т.л. 20 беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі: П.Р.*Алейнікаў*, Дз.Д.*Валенцік*, Б.В.Воўк (пасмяротна), І.І.*Валасевіч*, М.М.*Гармоза*, А.І.*Дыдышка*, П.В.*Кандрацьеў*, І.П.*Кірпічоў*, І.М.*Кобзун*, В.Дз.*Кучаравы* (пасмяротна), І.М.*Максімені*, І.В.*Матрунчык*, Р.С.*Пінчук*, М.В.Рапейка (пасмяротна), І.М.*Саламонікаў*, М.П.Сінюцін, М.Ф.*Турцэвіч* (пасмяротна), А.Р.*Целяшоў* (пасмяротна), С.І.*Чарняк*, С.Я.*Ялейнікаў* (пасмяротна).

Далучэнне ў выніку С.-ф.в. стратэгічна важных тэрыторый каштавала СССР не толькі вял. чалавечых ахвяр, але і падрыву яго міжнар. аўтарытэту. Сусв. грамадскасць расцаніла вайну супраць Фінляндыі як агрэсію, у выніку чаго СССР у снеж. 1939 быў выключаны з *Лігі Нацый*. Напярэдадні Вял. Айч. вайны ўзмацнілася прагерм. арыентацыя Фінляндыі, якая потым выступіла супраць СССР на баку Германіі.

Літ.: «Зимняя война», 1939—1940. Кн. 1—2. М., 1999; Советско-финская война 1939—1940 гг. Мн., 1999; Тайны и уроки зимней войны 1939—1940. М., 2000; Россия и СССР в войнах XX в.: Потери вооруженных сил: Стат. исслед. М., 2001. С. 200; Третьяк С. Зимняя кампания 1939—1940 гг. // Армия. 2000. № 2; Кушнер В., Фісуноў В. Савецка-фінляндская вайна 1939—1940 гг. // Бел. гіст. часоп. 2000. № 1.

Г.Дз.Бабусенка.

САВЕ́ЦКА-ФІНЛЯ́НДСКІЯ ДАГАВО́РЫ І ПАГАДНЕ́ННІ. Мірны дагавор 1920, падпісаны 14 кастр. ў Тарту. Абвясціў спыненне вайны паміж абедзвюма дзяржавамі, пацвердзіў незалежнасць і суверэнітэт Фінляндыі, урэгуляваў тэр. пытанні. Сав. ўрад пацвердзіў перадачу Фінляндыі Печэнгскай вобл. Фінляндыя абавязалася не трымаць у водах узбярэжжа Паўн. Ледавітага ак. падводных лодак, ваен. самалётаў і суднаў. Абодва бакі пагадзіліся не мець у бас. Ладажскага воз. ваен. збудаванняў, якія служаць агрэсіўным мэтам, і ваен. суднаў водазмяшчэннем больш за 100 т. У дагаворы запісана пра ўтварэнне ў складзе РСФСР Усх.-Карэльскай аўт. вобласці на аснове нац. самавызначэння. Мірны дагавор 1940, падпісаны 12 сак. ў Маскве. Абвясціў спыненне *савецка-фінляндскай вайны 1939—40*. Вызначалася новая лінія сав.-фінл. дзярж. граніцы. СССР адыходзілі: Карэльскі перашыек з г. Выбаргам (Вііпуры) і Выбаргскі зал. з астравамі; зах. і паўн. ўзбярэжжы Ладажскага воз. з гарадамі Кексгольм, Сортавала, Суаярві, шэраг астравоў у Фінскім зал.; тэр. на ўсход ад Мерк'ярві з г. Куалаярві; частка п-авоў Рыбачы і Сярэдні. Бакі абавязаліся ўстрымлівацца ад нападу адзін на аднаго і не ўступаць у варожыя кааліцыі, накіраваныя супраць аднаго з бакоў. СССР атрымаў у арэнду на 30 гадоў п-аў Ханка. У 1941 Фінляндыя парушыла дагавор і ўступіла ў вайну супраць СССР на баку фаш. Германіі. Пасля паражэння Фінляндыі ў вайне 19.9.1944 падпісана пагадненне аб перамір'і, а 10.2.1947 — мірны дагавор 1947, які прадугледжваў аднаўленне дагавора 1940 са зменамі. Дагавор 1948 аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе, падпісаны 6 крас. ў Маскве на 10 гадоў. Бакі заявілі пра імкненне супрацоўнічаць дзеля інтарэсаў міру і бяспекі, у адпаведнасці з мэтамі і прынцыпамі ААН. Адзначана імкненне Фінляндыі заставацца ў баку ад супярэчнасцей паміж інтарэсамі вялікіх дзяржаў. СССР і Фінляндыя згадзіліся кансультавацца пры ўзнікненні пагрозы ваен. нападу, пацвердзілі намеры ўдзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах, якія накіраваны на падтрыманне міжнар. міру і бяспекі. У дагаворы пацверджаны абавязак не заключаць саюзаў і не ўдзельнічаць у кааліцыях, накіраваных супраць аднаго з бакоў. Дагавор стаў асноватворным дакументам сав.-фінл. адносін; на аснове яго атрымала шырокае і ўсебаковае развіццё паліт., эканам. і культ. супрацоўніцтва паміж СССР і Фінляндыяй. Тэрмін дзеяння дагавору быў прадоўжаны ў 1955 і ў 1970 на 20 гадоў. 6.6.1983 СССР і Фінляндыя падпісалі пратакол, паводле якога дагавор застаецца ў сіле на наступныя 20-гадовыя перыяды, калі ні адзін з бакоў не заявіць аб жаданні спыніць яго дзеянне.

САВЕ́ЦКА-ФРАНЦУ́ЗСКІЯ ДАГАВО́РЫ І ПАГАДНЕ́ННІ. Пакт 1932 аб ненападзе паміж СССР і Францыяй, падпісаны 29 ліст. ў Парыжы. Краіны пацвердзілі прынцып адмаўлення ад вайны як сродку вырашэння міжнар. спрэчак, абавязаліся не ваяваць адна супраць адной, не ўмешвацца ва ўнутр. справы адна адной, не перашкаджаць развіццю ўзаемнага гандлю. Тэрмін дзеяння пакта не быў вызначаны. Дагавор 1935 аб узаемнай дапамозе, падпісаны 2 мая ў Парыжы на 5 гадоў. Урады абедзвюх дзяржаў абавязваліся пры пагрозе нападу на адзін з бакоў якой-н. еўрап. дзяржавы пачаць адразу кансультацыі, у выпадку нападу на СССР або Францыю адразу аказаць дапамогу і падтрымку. Пасля зрыву *Маскоўскіх перагавораў 1939* дагавор фактычна страціў значэнне. Франка-савецкае камюніке 1942 аб адносінах урада СССР да руху «Змагарная Францыя» і «Французскага нацыянальнага камітэта», падпісана 28 верасня. Сав. ўрад выказаў гатоўнасць памагчы руху Супраціўлення, прызнаў Французскі нац. камітэт кіраўнічым органам «Змагарнай Францыі» і адзіным органам, які мае права арганізоўваць удзел у вайне франц. грамадзян і тэрыторыі і прадстаўляць іх інтарэсы пры ўрадзе СССР. Дагавор 1944 аб саюзе і ўзаемнай дапамозе, падпісаны ў Маскве 10 снежня. СССР і Францыя абавязваліся: працягваць сумесную барацьбу да перамогі над фаш. Германіяй, не ўступаць з ёю ў сепаратныя перагаворы і не заключаць без узаемнай згоды перамір'я ці міру з гітлераўскім урадам; пасля вайны разам рабіць усе неабходныя захады для ліквідацыі любой інш. пагрозы з боку Германіі, не ўдзельнічаць у кааліцыях, накіраваных супраць дагаворных бакоў. Прыём у 1955 ФРГ у НАТО быў расцэнены сав. бокам як парушэнне Францыяй узятых на сябе абавязацельстваў, таму дагавор быў ануляваны Вярх. Саветам СССР у тым жа годзе. Савецка-французская дэкларацыя 1966, падпісана 30 чэрв. ў Маскве. Бакі выказалі жаданне развіваць узаемныя абмены і супрацоўніцтва, вырашылі прадаўжаць паміж сабой кансультацыі па еўрап. і інш. міжнар. праблемах. Дэкларацыя падкрэслівала значэнне падпісаных міжурадавых пагадненняў аб супрацоўніцтве ў галіне вывучэння і асваення касм. прасторы ў мірных мэтах і аб навук.-тэхн. і эканам. супрацоўніцтве. Савецка-французскі пратакол 1970, падпісаны 13 кастр. ў Маскве. Пацвердзіў палажэнні дэкларацыі 1966. Бакі дамовіліся ў выпадку, калі ўзнікнуць сітуацыі, якія пагражаюць парушыць мір або выклікаць міжнар. напружанасць, адра-

зу ўступіць у кантакт адзін з адным, каб узгадніць пазіцыі, расшыраць і паглыбляць паліт. кансультацыі па важных міжнар. праблемах. Савецка-французская дэкларацыя 1971, падпісана ў Парыжы 30 кастрычніка. Пацвердзіла пратакол 1970 і адзначыла, што супрацоўніцтва паміж СССР і Францыяй не накіравана супраць інтарэсаў якога-н. народа, а мае на мэце садзейнічаць аднаўленню міру ў раёнах канфліктаў, эканам. развіццю і паляпшэнню ўмоў жыцця народаў, рэгуляваць спрэчныя пытанні мірнымі сродкамі. Абмен пісьмамі аб папярэджанні выпадковага або несанкцыяніраванага выкарыстання ядзернай зброі. Адбыўся 16.7.1976 у Маскве. Краіны абавязаліся ажыццяўляць і ўдасканальваць арганізац. і тэхн. меры па прадухіленні выпадковага або несанкцыяніраванага выкарыстання ядзернай зброі, якая знаходзіцца пад іх кантролем. Праграма далейшага развіцця супрацоўніцтва паміж СССР і Францыяй на карысць разрадкі і міру, падпісана ў Маскве 8.4.1979, як выражэнне волі народаў абедзвюх краін да падтрымкі ўстойлівых дружалюбных адносін.

САВЕ́ЦКА-ЭСТО́НСКІЯ ПАГАДНЕ́НІ. Мірны дагавор 1920 (Тартускі дагавор), падпісаны 2 лют. ў г. Тарту (Эстонія) паміж РСФСР і Эст. Рэспублікай, спыніў удзел Эстоніі на баку Антанты ў вайне супраць Сав. Расіі (дагавор аб прыпыненні ваен. дзеянняў падпісаны ў Тарту 31.12.1919). Складаўся з 20 артыкулаў і шэрагу дадаткаў. Забяспечыў прызнанне Сав. Расіяй незалежнасці і самастойнасці эст. дзяржавы, вызваленне Эстоніі ад адказнасці па даўгавых і інш. абавязацельствах Расіі, перадачу Эстоніі ўсёй рас. маёмасці на яе тэр. (у т.л. суднаў, акцый фірмаў) і 15 млн. руб. з залатога запасу Расіі, што гарантавала пакрыццё золатам папяровых эст. грошай. Да Эст. Рэспублікі адышлі землі, прылеглыя да ўсх. берага р. Нарва, і раён Пячоры (Петсеры) з крэпасцю *Ізборск* (гл. карту). Дагаворам устанаўліваліся дыпламат. і консульскія адносіны. Ён дзейнічаў да ўваходжання Эстоніі ў склад СССР (лета 1940), у 1990—91 стаў адной з юрыд. падстаў для аднаўлення эст. дзяржаўнасці. Сучасная мяжа паміж Рас. Федэрацыяй і Эстоніяй устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета СССР ад 23.8.1944 і пастановамі Вярх. Саветаў РСФСР і Эст. ССР, прынятымі ў 1957. Дагавор 1932 аб ненападзе і мірным вырашэнні канфліктаў, падпісаны 4 мая ў Маскве паміж СССР і Эстоніяй тэрмінам на 3 гады. Бакі абавязваліся ўстрымлівацца ад нападаў і дзеянняў, накіраваных супраць тэр. цэласнасці і паліт. незалежнасці, ад удзелу ў пагадненнях і кааліцыях, накіраваных супраць другога боку. Пратаколам ад 4.4.1934 дагавор працягнуты да 31.12.1945. Пакт аб узаемадапамозе 1939, падпісаны 28 вер. ў Маскве паміж СССР і Эст. Рэспублікай па ініцыятыве сав. боку ва ўмовах пачатку 2-й сусв. вайны. Бакі абавязваліся не ўдзельнічаць у саюзах і кааліцыях, накіраваных супраць другога боку, узаемна дапамагаць, у т.л. і ў выпадку ваен. нападу ці пагрозы з боку інш. дзяржавы. Эстонія дазволіла СССР мець на а-вах Саарэмаа (Эзель), Хіума (Дага) і ў г. Пальдыскі ваен.-марскія базы і аэрадромы на правах арэнды і сав. вайск. часці для іх аховы. У чэрв. 1940 на падставе гэтага пакта Сав. Саюз увёў свае войскі ў Эстонію, у выніку чаго там адбылася змена дзярж. улады і ладу, а рэспубліка была ўключана ў склад СССР (жн. 1940).

Літ.: Полпреды сообщают...: Сб. док. об отношениях СССР с Латвией, Литвой и Эстонией, авг. 1939 г. — авг. 1940 г. М., 1990.

У.Я.Калаткоў.



САВЕ́ЦКАЯ А́РМІЯ, афіцыйная назва ў 1946—91 *Узброеных сіл СССР* (акрамя ВМФ, Пагран. і Унутр. войск, якія ў склад Савецкай Арміі не ўваходзілі). Да лют. 1946 называлася *«Чырвоная Армія»*.

«САВЕ́ЦКАЯ БЕЛАРУ́СЬ», назва кінастудыі *«Беларусьфільм»* у 1928—46.

«САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ», назва выдавецтва *«Беларусь»* да 1963.

«САВЕ́ЦКАЯ БЕЛАРУ́СЬ», штодзённая грамадска-паліт. газета. Выдавалася з 1.2.1920 у Смаленску, з 15.8.1920 да 21.3.1933 у Мінску на бел. мове. Першыя 10 нумароў выдаваліся 2 разы на тыдзень Бел. рэд. калегіяй ЦК КП(б) Літвы і Беларусі як 2-тыднёвы часопіс. З 15.8.1920 орган Рэўкома БССР, з 19.12.1920 — ЦВК БССР, з 16.1.1930 — ЦВК і СНК БССР. Адказныя рэдактары ў розныя гады: С.Булат, З.Жылуновіч (Ц.Гартны), У.Ігнатоўскі, М.Кудзелька (М.Чарот) і інш. Адлюстроўвала сац. і грамадска-паліт. працэсы, развіццё эканомікі, літ. руху і маст. культуры БССР у 1920 — пач. 1930-х г. Збірала вакол сябе раскіданыя па краіне літ. сілы, спрыяла творчаму супрацоўніцтву старэйшых і маладых пісьменнікаў. Друкавала творы А.Бабарэкі, Я.Бобрыка, П.Броўкі, З.Бядулі, А.Вечара, А.Вольнага, М.Гарэцкага, У.Дубоўкі, А.Дудара, М.Зарэцкага, Я.Коласа, К.Крапівы, А.Куляшова, Я.Купалы, М.Лынькова, Я.Пушчы, Л.Родзевіча, П.Труса, К.Чорнага і інш. пісьменнікаў, літ.-знаўцаў, публіцыстаў і краязнаўцаў. Наладжвала літ.-маст. вечары і дыскусіі (пра БДТ-1, творчасць Ц.Гартнага, М.Чарота, М.Грамыкі), асвятляла тэатр. і муз. жыццё рэспублікі, маст. і этнагр. выстаўкі, садзейнічала ахове помнікаў прыроды, гісторыі і культуры. У 1930—33 ва ўмовах рэпрэсій, пашырэння вульгарна-сацыялагічнай крытыкі са старонак газеты зніклі лірычныя вершы, апавяданні, аб'ектыўныя навук. і крытычныя матэрыялы пра бел. нац. культуру, партрэты пісьменнікаў і мастакоў. Публікаваліся пераважна юбілейныя творы, апавяданні і нарысы на вытв. тэму, вульгарнасацыялагічныя артыкулы і інш. Выдавала літ. дадаткі-часопісы «Радавая рунь» (1924), «Чырвоная краіна» (1927, 1929), «Літаратурны дадатак да газеты «Савецкая Беларусь» (1928).

У.М.Конан.

«САВЕ́ЦКАЯ БЕЛАРУ́СЬ», назва газеты *«Советская Белоруссия»* ў 1941—44.

САВЕ́ЦКАЯ ВО́ЎНАВАЯ ПАРО́ДА коз, воўнавага кірунку. Выведзена ў 1947—62 у Сярэдняй Азіі і Казахстане скрыжаваннем мясц. грубашэрсных парод з казламі *ангорскай пароды*. Выкарыстоўваюць для паляпшэння воўнавай прадукцыйнасці мясц. грубашэрсных парод коз. Гадуюць у краінах Сярэдняй Азіі, Казахстане, на Паўн. Каўказе.

Жывёлы буйныя, моцнай канстытуцыі. Маса казлоў 55—65, матак 38—40 кг. Воўна 46—56-й якасці, даўж. да 20 см, ангорскага тыпу, паўтонкая, белая, з люстраным бляскам. Гадавы настрыг воўны з казлоў 3—4, з матак 1,6—2 кг. Выхад чыстай воўны 75—80%. Плоднасць 105—110 казлянят на 100 матак.

«САВЕ́ЦКАЯ КРАІ́НА», назва час. *«Наш край»* у 1930—33.

САВЕ́ЦКАЯ ЦЯЖКАВО́ЗНАЯ ПАРО́ДА коней, выведзена ў сярэдзіне 20 ст. ў СССР скрыжаваннем мясц. запражных коней пераважна з бельгійскімі жарабцамі — брабансонамі. Зацверджана ў 1952. На Беларусі выкарыстоўвалася для паляпшэння *беларускіх запражных коней* і *палескіх коней*.

Жывёлы дужай канстытуцыі, масіўнага целаскладу, з развітой мускулатурай. Галава сярэдніх памераў, шыя кароткая і мускулістая, карак нізкі і шырокі, грудзі шырокія, крыж звіслы, падвоены. Асн. масці — рыжая, пярэста-рыжая, зрэдку гнядая, пярэста-гнядая. Сярэдняя маса жарабцоў 780 кг, выш. ў карку 160, касая даўж. цела да 170 см; кабылы драбнейшыя. Вызначаюцца скараспеласцю, даўгалеццем (гасп. выкарыстанне 17 гадоў), высокімі грузападымальнасцю, працаздольнасцю, высокімі паказчыкамі малочнай (да 5 тыс. кг малака за год) і мясной прадукцыйнасці.

САВЕ́ЦКАЯ ШЫНШЫ́ЛА, парода трусоў мяса-шкуркавага кірунку. Выведзена ў 1948—63 у СССР скрыжаваннем дробных трусоў пароды *шыншыла* з *белым волатам*. Пашырана ў СНД.

Жывёлы буйныя, моцнай канстытуцыі. Тулава кампактнае, падоўжанае (60—70 см), абхват грудзей 37—42 см, сярэдняя маса 5 (да 7) кг. Валасяное покрыва шчыльнае, занальнае, серабрыста-шэра-блакітнае, на грудзях, спіне, баках, крыжы — больш цёмнае, на шыі, чэраве, унутр. баках ног — амаль белае. Характэрны светлая аблямоўка вакол вачэй і светла-шэры клін на патыліцы. Плоднасць 7—8 трусянят. Скараспелыя.

Савецкая воўнавая парода коз.

Савецкая цяжкавозная парода коней.

Савецкая шыншыла.

САВЕ́ЦКА-ЯПО́НСКАЯ ВАЙНА́ 1945, ваенныя дзеянні 9.8—2.9.1945 савецкіх узбр. сіл па разгроме войск Японіі на Д.Усходзе ў час 2-й сусв. вайны; працяг *Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза 1941—45*. Пасля нападу фаш. Германіі на СССР Японія, нягледзячы на наяўнасць дагавора аб нейтралітэце (падпісаны 13.4.1941) дапамагала Германіі (на граніцы з Сав. Саюзам мела вял. групоўку войск, што вымушала СССР трымаць на Д.Усходзе значныя вайск. сілы, парушала граніцу, перашкаджала сав. суднаходству). Пасля разгрому фаш. Германіі ў маі 1945 яе саюзніца Японія працягвала вайну супраць Кітая, ЗША, Вялікабрытаніі і інш. 5.4.1945 Сав. Саюз дэнансаваў сав.-яп. дагавор аб нейтралітэце і, выконваючы саюзніцкія абавязацельствы ў адпаведнасці з рашэннямі *Крымскай канферэнцыі 1945* і *Патсдамскай канферэнцыі 1945*, пасля адмовы Японіі выканаць патрабаванні саюзнікаў СССР па антыфаш. кааліцыі аб безумоўнай капітуляцыі 8.8.1945 абвясціў вайну Японіі. У ноч на 9 жн. войскі Забайкальскага (Маршал Сав. Саюза Р.Я.Маліноўскі), 1-га (Маршал Сав. Саюза К.А.Мерацкоў) і 2-га (ген. арміі М.А.Пуркаеў) Далёкаўсходніх франтоў, караблі Ціхаакіянскага флоту (адмірал І.С.Юмашаў) і Амурскай ваен. флатыліі (контр-адм. А.В.Антонаў), а з 10 жн. таксама войскі Манг. Нар.-Рэв. Арміі (Маршал Х.Чайбалсан) пад агульным кіраўніцтвам Маршала Сав. Саюза А.М.Васілеўскага пачалі наступленне. Сав. войскі налічвалі больш за 1,5 млн. чал., 26 тыс. гармат і мінамётаў, больш за 5500 танкаў і самаходна-артыл. установак, каля 3800 самалётаў, Ціхаакіянскі флот і Амурская флатылія — каля 600 караблёў і падводных лодак і больш за 1500 самалётаў. Ім процістаялі яп. сілы ў Маньчжурыі, Карэі, на Паўд. Сахаліне і Курыльскіх а-вах (1,2 млн. чал., каля 1200 танкаў, 5400 гармат і каля 1800 самалётаў). Сав. войскі атакавалі праціўніка па ўсёй граніцы з Маньчжурыяй і ўздзяржжы Паўн. Карэі. Да 14 жн. Забайкальскі і 1-ы Далёкаўсходні франты прасунуліся ўглыб на 150—450 км, у Маньчжурыі расчлянілі *Квантунскую армію* японцаў, штаб якой адмаўляўся ад капітуляцыі. 19 жн. яп. войскі пачалі капітуляцыю (гл. *Маньчжурская аперацыя 1945*), але сав. войскі працягвалі наступленне: вызвалены 11—25 жн. Паўд. Сахалін, 18 жн.—1 вер. Курыльскія а-вы (гл. *Паўднёва-Сахалінская аперацыя 1945, Курыльская дэсантная аперацыя 1945*). 2.9.1945 Японія падпісала акт аб капітуляцыі. Страты сав. боку: 36 456 чал., у т.л. незваротныя (забітыя, памерлыя ад ран) 12 031 чал.; з яп. боку 803 269, у т.л. незваротныя 83 717. Скончылася 2-я сусв. вайна. СССР вярнуў Паўд. Сахалін, яму адышлі і Курыльскія а-вы. За баявыя подзвігі ў С.-я.в. 87 воінам прысвоена званне Герояў Сав. Саюза, сярод якіх беларусы М.У.*Барташоў*, Г.С.*Здановіч*, В.А.*Кот*, М.А.*Ласкуноў*, Ц.А.*Пачтароў*.

Да арт. **Савецка-японская вайна 1945**. Жыхары кітайскага г. Далянь (Дальні) вітаюць савецкіх воінаў. Жнівень 1945.

Літ.: История Великой Отечественной войны Советского Союза, 1941—1945 гг. Т. 5. М., 1963; Финал: Ист.-мемуарный очерк о разгроме империалистической Японии в 1945 году. 2 изд. М., 1969; Яковлев Н.Н. 3 сентября 1945. М., 1971; История второй мировой войны, 1939—1945. Т. 11. М., 1980; По дорогам Китая, 1937—1945: Воспоминания.


САВЕЦКА-ЯПОНСКАЯ ВАЙНА 9.8–2.9.1945г.
Маштаб 1:15 000 000
Асноўныя аперацыі савецкіх войск і флоту
Маньчжурская наступальная аперацыя 9 8 –2.9
Паўднёва-Сахалінская наступальная аперацыя 11–25.8
Курыльская дэсантная аперацыя 18 8–1.9
МАНГОЛЬСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА
Даты абвяшчэння вайны Японіі
СССР 10. 8. 1945 МНР
Штаб Галоўнага камандавання савецкіх войск на Далёкім Усходзе
Штаб фронту, флоту
Лінія фронту 9.8
Напрамкі ўдараў савецкіх войск
агульнавайсковых армій
6 гвардзейскай танкавай арміі
10 механізаванага корпуса
Баявыя дзеянні Амурскай флатыліі
Марскі дэсант і даты высадкі войск
Удары авіяцыі
Паветраны дэсант
Напрамкі ўдараў савецка-мангольскай КМГ і часцей НВАК (Народна-вызвалечай арміі Кітая)
Напрамкі ўдараў японскіх войск
Аэрадромы
Лінія фронту 14 8
Штаб Квантунскай арміі
Раёны сканцэнтравання войск
Умацаваныя раёны праціўніка
Абарончыя рубяжы праціўніка
Атамныя бомбы, скінутыя авіяцыяй ЗША на японскія гарады
Падпісанне Акта аб капітуляцыі Японіі
Ерофей Пайлавіч
Скавародзіно
Зея
Немуй
Чумікан
Ныўрава
Аха
Нікалаеўск-на-Амуры
Рыбнаўск
Петрапаўлаўск-Камчацкі
Погібі
Сафійскае
Аляксандраўск-Сахалінскі
Парамушыр
Сямусю
Анекатан
Сяекатан
Мацува
Кетой
Сімушыр
Урап
Хума
Свабодны
Сярэд. Ургал
Камсамольск-на-Амуры
Катон
Тора
Маока
Атамары
Сяна
Іітуруп
Ваканай
Куношыр
Шыкатан
Фурукамапу
Асахікава
Немура
Атару
Сапара
Абіхіра
Мураран
Хакадатэ
Аміната
Аомары
Акіта
Ямагата
Сендай
Ніігата
Сада
Нагана
Канадзава
Цуруга
Такасака
Якасука
Нагоя
Мацуя
Мойдзуру
Кобэ
Осака
Вакаяма
Хамамацу
Акаяма
Хірасіма
Курэ
Сіманосекі
Такусіма
Мацуяма
в. Сікоку
Модзі
Фукуока
Оіта
Сасеба
Нагасакі
в. Кюсю
в. Чэджудо
Стары Цурухайтуй
Благавешчанск
Хэйхэ
Суньу
Нуньцзян (Мэргень)
Бэянь (Бэяньчжэнь)
Фашань
Бірабіджан
Валачаеўка
Хабараўск
Савецкая Гавань
Ленінское
Нельма
Тунцзян
Цзямусы
Баоцын
Хутоў
Іман
Фугдзін
Бікін
Жаахэ
Светлая
Харбін
Мішань
Балі
Імяньбо
Муданьцзян
Градзекава
Варашылаў
Дунін
Ольга
Дуньхуа
Хунчунь
Уладзівасток
Пасьет
Находка
Тумынь
Фусун
Фусінь
Чанчунь
Гірын
Сыпін
Ліньсі
Дабаньшан (Баліньюцы)
Тунляо
Чыфын
Цзіньчжоў
Чжанцзякоў (Калган)
Чэндэ (Жэхэ)
Шэньян (Мукдэн)
Аньшань
Інкоў
Пекін (Бэйпін)
Таншань
Тунчжоў
Чансыр
Далунь (Долон-Нур)
Чахар
Ланьсі
Цзіньчжоў
Хулун-Аршан
Салунь (Салон)
Удан-Хото (Ван'емяо)
Тамсог-Булак
Цыцыкар
Чжаланьтунь
Хайлар
Маньчжурыя
Чжалайнор
Дэўры
Дэтэлі-Нур
Эрэн-Хота (Эрлянь)
Панцзян
Шыцзячжуан
Цзінань
Вэйфан
Вэйхай
Цзінін
Цындао
Кайфын
Гуйдэ
Сюйчжоў
Ляньюньган
Датун
Пекін (Бэйпін)
Таншань
Пяньцзінь
Ляодунскі п-аў
п-аў Гуаньдун (Ян.)
Люйшунь (Порт-Артур)
Далянь (Дальні)
Нампхо
Пхеньян
Вансан
Хэдзю
Інчхон (Чэмульпо)
СЕУЛ Канын
в. Ульндо (Карэя)
Цзінань
Цзінін
Цындао
Кунсан
Тэджан
Тэгу
Пусан
Макпхо
Цусіма (Ян.)
Хэдзянскі п-аў
Заходнія Карэйскія а-вы
Усходнія Карэйскія а-вы
Ян.
Японскае мора
Японскія а-вы
Ціхі акіян
ТОКІО
Ізу
Сагамі
Сагамскі зал.
Ізуская гряда
Ізу-Бонінскія а-вы
Бонінскія а-вы
Марыянскія а-вы
Каралінскія а-вы
Маршалавы а-вы
Гілбертавы а-вы
Маршалавы а-вы
Маньчжурскія горы
Усходне-Маньчжурскія горы
Вялікі Хінган
Малы Хінган
Сіньшаньчжэнь
Тан'юань
Цзіньчжоў
Чжэнхуа
Хэгана (Сіньшаньчжэнь)
Ханьдаохэцзы (Сейсін)
Наньцзін (Расін)
Нанам (Ранан)
Сандзін (Кім-Чак)
Хамхын (Канко)
Хынам
Вансан
Даньдун (Аньдун)
Ліаодунскі п-аў
Заходнія Карэйскія а-вы
Усходнія Карэйскія а-вы
Ян.
Японскае мора
Японскія а-вы
Ціхі акіян
ТОКІО
Ізу
Сагамі
Сагамскі зал.
Ізуская гряда
Ізу-Бонінскія а-вы
Бонінскія а-вы
Марыянскія а-вы
Каралінскія а-вы
Маршалавы а-вы
Гілбертавы а-вы
Маршалавы а-вы
Маньчжурскія горы
Усходне-Маньчжурскія горы
Вялікі Хінган
Малы Хінган
Сіньшаньчжэнь
Тан'юань
Цзіньчжоў
Чжэнхуа
Хэгана (Сіньшаньчжэнь)
Ханьдаохэцзы (Сейсін)
Наньцзін (Расін)
Нанам (Ранан)
Сандзін (Кім-Чак)
Хамхын (Канко)
Хынам
Вансан
Даньдун (Аньдун)

М., 1989. С. 281—361; Хаттори Т. Япония в войне, 1941—1945: Пер. с яп. [2 изд.] СПб., 2000. *Ю.В.Бажэнаў, В.А.Юшкевіч.*

САВЕ́ЦКА-ЯПО́НСКІЯ ПАГАДНЕ́ННІ. Канвенцыя 1925 аб асноўных прынцыпах узаемаадносін, падпісана ў Пекіне 20 студз. Паводле яе паміж СССР і Японіяй устанаўліваліся дыпламат. адносіны; Японія абавязалася да 15.5.1925 вывесці свае войскі з Паўн. Сахаліна; бакі дэкларавалі імкненне жыць у міры і дружбе і абавязаліся ў сваіх адносінах зыходзіць з прынцыпу ўзаемнага неўмяшання ва ўнутр. справы адзін аднаго. СССР пагадзіўся, што *Портсмуцкі мірны дагавор 1905* застаецца ў сіле. Бакі дамовіліся аб пераглядзе рас.-яп. пагадненняў, якія закраналі пытанні гандлю, эканомікі і рыбалоўства (гл. *Руска-японскія дагаворы і пагадненні*). Пагадненне 1939 аб спыненні ваенных дзеянняў у раёне Халхін-Гола, падпісана 15 ліст. ў Маскве. Паклала канец *Халхін-Гольскаму канфлікту 1939*, зафіксаваўшы аднаўленне граніцы Манг. Нар. Рэспублікі, як да пач. канфлікту. Пакт 1941 аб нейтралітэце, падпісаны 13 крас. ў Маскве. Паводле яго бакі абавязаліся падтрымліваць мірныя і дружалюбныя адносіны адзін да аднаго; узаемна паважаць цэласнасць тэрыторыі адзін аднаго; у выпадку ўцягвання аднаго з бакоў у вайну з адной або некалькімі трэцімі дзяржавамі інш. бок абавязаўся захоўваць нейтралітэт на працягу ўсяго канфлікту. Скасаваны з уступленнем 9.8.1945 СССР у вайну з Японіяй. Савецка-японская сумесная дэкларацыя 1956, падпісана 19 кастр. ў Маскве. Спыняла стан вайны, які існаваў паміж СССР і Японіяй з 9.8.1945; паміж дзвюма дзяржавамі аднаўляліся дыпламат. адносіны; прадугледжвалася, што ў магчыма кароткі тэрмін паміж СССР і Японіяй пачнуцца перагаворы аб усёабдымным мірным урэгуляванні; пасля такога ўрэгулявання СССР абавязаўся перадаць Японіі а-вы Шыкатан і Хабамаі з *Курыльскіх астравоў* (пазней СССР адмовіўся ад гэтага абавязку ў аднабаковым парадку); СССР пагадзіўся на *рэпатрыяцыю* ўсіх яп. грамадзян, якія былі асуджаны на сав. тэрыторыі.

САВЕ́ЦКІ МАРДЭ́Р (ад ням. Marder куніца), парода трусоў шкуркавага кірунку. Выведзена ў 1930—40 у Арменіі складаным скрыжаваннем мясц. блакітных трусоў з рускім гарнастаевым трусам і *шыншылай*. Гадуюць пераважна ў Арменіі, на Беларусі — аматары.

Жывёлы сярэдніх памераў, моцнага цела-складу, з кароткім тулавам (47—50 см), абхват грудзей 28—35 см. Сярэдняя маса 3,8 (да 5) кг. Поўсць шчыльная, мяккая, бліскучая, колерам нагадвае поўсць куніцы: у нованароджаных трусоў мышастая, у дарослых — светла і цёмна-карычневая (больш каштоўная). Плоднасць 7—8 трусянят. Шкуркі выкарыстоўваюць у натуральным выглядзе ці імітуюць пад больш каштоўнае футра.

САВЕ́ЦКІ МЕРЫНО́С, парода танкарунных авечак воўнавага і мяса-воўнавага кірунку. Выведзена ў 1920—51 у паўд. раёнах еўрап. ч. СССР паляпшэннем і скрыжаваннем мазаеўскіх і новакаўказскіх авечак з баранамі *асканійскай пароды, прэкас, рамбулье*, каўказскай і інш. Выкарыстоўваліся пры вывядзенні грузінскай танкаруннай і забайкальскай парод. У 1960—80 адна са шматлікіх танкарунных парод авечак у СССР. Гадуюць пераважна ў Расіі (паўд. раёны, Зах. Сібір і інш.) і Казахстане.

Жывёлы моцнай канстытуцыі, з прапарцыянальным тулавам, магутным касцяком. Скура шчыльная, на шыі 1—2 невял. папярочныя складкі ці 1 падоўжная (бурда). Маса бараноў 90—110 (да 130) кг, матак 50—55 (да 70) кг. Руно самкнутае, воўна мерыносавая, эластычная, мяккая, ураўнаваная па тонкасці і даўж. (7,5—10 см), з раўнамернай пакручастасцю. Настрыг воўны з бараноў 13—16 (да 24) кг, з матак 5—7 кг. Выхад чыстай воўны 36—42%. Плоднасць 120—140 ягнят на 100 матак.

Савецкі мардэр.

Савецкі мерынос.

«САВЕ́ЦКІ ЭНЦЫКЛАПЕДЫ́ЧНЫ СЛО́ЎНІК» («СЭС»), першы аднатомны універсальны даведнік у СССР. Выдадзены ў Маскве выд-вам «Савецкая Энцыклапедыя». Выйшлі 4 выданні: 1-е ў 1979 (дадатковыя тыражы ў 1981— 82), 2-е ў 1983, 3-е ў 1984 (дадатковы тыраж у 1985), 4-е ў 1987 (дадатковы тыраж у 1989). Змяшчае каля 80 тыс. артыкулаў па пытаннях грамадска-паліт. жыцця, эканомікі, навукі, тэхнікі, літаратуры і мастацтва. Побач з артыкуламі пра саюзныя, аўтаномныя рэспублікі, краі, вобласці, гарады СССР уключана вял. колькасць артыкулаў пра розныя краіны свету, найбольшыя замежныя гарады, змешчаны біяграфіі дзярж., паліт., ваен. і культ. дзеячаў усіх часоў і народаў. У выданні 550 малюнкаў, фотаздымкаў і схем, 350 карт. «СЭС» паслужыў асновай для выдання «Вялікага энцыклапедычнага слоўніка» (т. 1—2, 1991; 2-е выд. 2000 у адным томе), «Расійскага энцыклапедычнага слоўніка» (кн. 1—2, 2000), «Новага энцыклапедычнага слоўніка» (2000). Перавыдаваўся за мяжой на англ., кіт. і інш. мовах. *В.К.Шчэрбін.*

САВЁНАК Лявон (Леанід Вікенцьевіч; 26.6.1897, в. Вялец Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. — 21.2.1974), бел. пісьменнік і журналіст. Бацька З.*Кіпель*. Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю (1914). Настаўнічаў. У 1921—29 працаваў у рэдакцыі газ. «Савецкая Беларусь». Друкаваўся з 1927 пад псеўд. Леанід Свэн, Л.Крывічанін. Аўтар зб. фельетонаў «Чароўная іголка» (1929). У 1933 рэпрэсіраваны, высланы ў Сібір, пазней — у Комі АССР. Пасля адбыцця высылкі вярнуўся на Беларусь, настаўнічаў. У Вял. Айч. вайну супрацоўнічаў у «Беларускай газэце» (апубл. «Дзённік Чужанінава»). З 1944 у Германіі, з 1950 у ЗША. Друкаваўся ў газ. «Бацькаўшчына», «Беларус», час. «Сакавік» і інш. выданнях. Рэабілітаваны ў 1956.

Тв.: Беларусізацыя пад № ... Нью-Ёрк, 1998.

Літ.: Успамінае Антон Шукелойць // Спадчына. 1997. № 5. *Л.С.Савік.*

САВІК Лідзія Сямёнаўна (н. 1.3.1936, в. Камуна Любанскага р-на Мінскай вобл.), бел. літаратуразнавец і крытык. Сястра І.С.*Шыкуновай*. Канд. філал. н. (1977). Акад. Міжнар. АН Еўразіі (1995). Скончыла БДУ (1962). Настаўнічала. Працавала ў Цэнтр. б-цы імя Я.Коласа АН Беларусі, з 1978 у Ін-це л-ры Нац. АН Беларусі (адначасова з 1982 у Бел. ун-це культуры). Друкуецца з 1974. Даследуе праблемы развіцця бел. л-ры 20 ст., сучасны літ. працэс, спадчыну рэпрэсіраваных пісьменнікаў, творчасць пісьменнікаў бел. замежжа. Выдала творы С.Баранавых, Б.Мікуліча, Я.Нёманскага. Аўтар манаграфій «Адчуванне часу: Тэма вёскі ў сучаснай беларускай прозе» (1981), «Каб не астыла цяпло зямлі» (1984), «Пад мірным небам бацькаўшчыны: Нарыс творчасці Б.Сачанкі» (1986), «Вяртанне: Жыццяпіс Б.У.Кіта» (1993), арт. пра Н.Арсенневу, А.Асіпенку, Я.Брыля, В.Быкава, С.Грахоўскага, У.Дудзіцкага, А.Жука, Х.Ільяшэвіча, В.Іпатаву, М.Кавыля, У.Караткевіча, А.Кудраўца, І.Мележа, П.Місько, А.Саковіч, Б.Сачанку, Я.Сіпакова, Я.Скрыгана, У.Случанскага, М.Сяднёва, І.Шамякіна і інш. Сааўтар кніг «Беларускія пісьменнікі і літаратурны працэс 20—30-х гг.» (1985), «Сыны і пасынкі Бела-

русі» (1996), «Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы» (2001) і інш.

Тв.: Космас беларуса: Жыццяпіс Б.У.Кіта, асветніка, вучонага, патрыёта. 2 выд. Мн., 1998; Пакліканыя: Літаратура бел. замежжа. Мн., 2001. *І.Э.Багдановіч.*

І.С.**Савіна**.

САВІН Анатоль Іванавіч (н. 6.4.1920, г. Асташкаў Цвярской вобл., Расія), расійскі вучоны ў галіне аўтаматызаваных сістэм кіравання. Акад. Рас. АН (1984, чл.-кар. 1979). Герой Сац. Працы (1976). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча імя М.Э.Баўмана (1946). З 1946 на інж.-тэхн., канструктарскіх і кіраўнічых пасадах у спец. КБ і НВА. Навук. працы па касм. радыётэхніцы, радыёфізіцы і радыёэлектроніцы, па даследаванні аўтаматызаваных інфарм. сістэм, стварэнні радыётэхн. сродкаў кіравання рухомымі аб'ектамі, канструяванні радыёінтэрферометраў з вял. базай і распрацоўцы аўтаматызаваных сістэм кіравання спец. прызначэння. Ленінская прэмія 1972. Дзярж. прэмія СССР 1946, 1949, 1951, 1981.

САВІНА Ія Сяргееўна (н. 2.3.1936, г. Варонеж, Расія), расійская актрыса. Нар. арт. Расіі (1977). Нар. арт. СССР (1990). Скончыла Маскоўскі ун-т (1958). З 1960 у Маскоўскім т-ры Массавета, з 1978 у Маск. маст. акад. т-ры імя М.Горкага (з 1989 — імя А.Чэхава). Творчасці С. уласцівы мяккая, абаяльная манера ігры, пранікнёны лірызм, майстэрства псіхал. аналізу: Соня («Пецярбургскія сны» паводле Ф.Дастаеўскага), Паліна Андрэеўна («Чайка» Чэхава), Ліка («Маскоўскі хор» Л.Петрушэўскай). З 1960 здымаецца ў кіно: «Дама з сабачкам» (1960), «Грэшніца» (1962), «Гісторыя Асі Клячынай, якая кахала, ды не выйшла замуж» («Асіна шчасце», 1967; Дзярж. прэмія СССР 1990), «Ганна Карэніна», «Служылі два таварышы» (абодва 1968), «Сюжэт для невялікага апавядання» (1970), «Месяц жнівень» (1971), «Кожны дзень доктара Каліннікавай» (1973), «Раманс пра закаханых» (1974), «Нос» (1977), «Гараж» (1980), «Прыватнае жыццё» (1982, Дзярж. прэмія СССР 1983), «Прадоўжыся, прадоўжыся, зачараванне...» (1984), «Сюжэт для двух апавяданняў» (1991) і інш.

САВІНА (дзявочае Падрамянцова) Марыя Гаўрылаўна (11.4.1854, г. Камянец-Падольскі, Украіна — 21.9.1915), расійская актрыса. Як праф. актрыса дэбютавала ў 1869 у Мінску (Полінька — «Даходнае месца» А.Астроўскага). З 1870 працавала ў Харкаве, Ноўгарадзе, з 1872 — у трупе акцёра П.Мядзведзева ў Казані, Саратаве, Арле. Выступала ў вадэвілях, аперэтах, лёгкіх камедыях. З 1874 у Александрынскім т-ры (С.-Пецярбург). Была лепшай выканаўцай ролі Мар'і Антонаўны за ўсю сцэн. гісторыю «Рэвізора» М.Гогаля. Яе ігра адметная маст. завершанасцю, лаканізмам і выразнасцю дэталей. Сярод роляў: Паліксена, Вара, Надзя, Вера Піліпаўна («Праўда — добра, а шчасце лепш», «Дзікунка», «Выхаванка», «Сэрца не камень» Астроўскага), Акуліна («Улада цемры» Л.Талстога), Верачка, Наталля Пятроўна («Месяц у вёсцы» І.Тургенева). Гастролі С. у Берліне (1899) садзейнічалі папулярызацыі рус. акцёрскага мастацтва за мяжой. Адзін з арганізатараў і старшыня Рус. тэатр. т-ва. Заснавальніца прытулку для састарэлых артыстаў (1896, цяпер Дом ветэранаў сцэны імя С. у С.-Пецярбургу).

Тв.: Горести и скитания. Л.; М., 1961.

Літ.: Шнейдерман И.И. М.Г.Савина. М.; Л., 1956.

САВІНКАЎ Барыс Віктаравіч (7.19.1879, г. Харкаў, Украіна — 7.5.1925), расійскі паліт. дзеяч, літаратар. Вучыўся ў Пецярбургскім ун-це (выключаны за ўдзел у студэнцкіх выступленнях). З 1898 у с.-д. групе «Рабочы сцяг». У 1901 сасланы ў Волагду, адкуль уцёк за мяжу. У 1903 уступіў у партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў), нам. кіраўніка іх баявой арганізацыі. Удзельнічаў у забойствах міністра ўнутр. спраў В.К.Плеве (1904) і вял. князя Сяргея Аляксандравіча (1905). У 1906 арыштаваны і прыгавораны да смяротнага пакарання, але ўцёк за мяжу. Пад псеўданімам В.Ропшын выпусціў аповесць «Конь бледны» (1909) і раман «Тое, чаго не было» (1914), у якіх узняў маральна-этычныя праблемы, звязаныя з тэрорам. З крас. 1917 у Расіі, камісар Часовага ўрада. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 удзельнічаў у падрыхтоўцы контррэв. змоў. Разам з С.Н.*Булак-Балаховічам* у пач. 1920-х г. арганізаваў рэйды ваен. атрадаў у Сав. Беларусь з тэр. Польшчы. Свае ўражанні пра Беларусь адлюстраваў у аповесці «Конь вараны» (1923). У жн. 1924 нелегальна перабраўся ў СССР. Арыштаваны ў Мінску. Прыгавораны да пакарання смерцю, заменена 10 гадамі турэмнага зняволення. У пісьмах з турмы заклікаў сваіх паплечнікаў адмовіцца ад барацьбы супраць сав. улады. Паводле афіц. версіі, скончыў самагубствам.

Тв.: Воспоминания террориста; Конь бледный; Конь вороной. М., 1990.

Літ.: История терроризма в России в документах, биографиях, исследованиях. 2 изд. Ростов н/Д, 1996. *У.Я.Казлякоў.*

САВІНЫ (Savigny) Фрыдрых Карл фон (21.2.1779, г. Франкфурт-на-Майне, Германія — 25.10.1861), нямецкі юрыст; заснавальнік *гістарычнай школы права*. У 1810—42 праф. Берлінскага ун-та. У 1842—48 прускі міністр па рэформе заканадаўства. Аўтар прац па рымскім і цывільным праве. У праграмнай працы «Пра схільнасць нашага часу да заканадаўства і правазнаўства» (1814) трактаваў права як прадукт нейкага містычнага «народнага духу», які развіваецца спантанна. Выступаў супраць кадыфікацыі герм. цывільнага права, знаходзячы яе заўчаснай (лічыў, што права не зыходзіць ад дзярж. улады і таму не можа ўстанаўлівацца заканадаўцам). Задачу юрыстаў бачыў у выяўленні «свядомасці народа» і ўзгадненні з ім дзеючага заканадаўства.

САВІНЫХ Віктар Пятровіч (н. 7.3.1940, с. Бярозкіны Кіраўскай вобл., Расія), савецкі касманаўт. Двойчы Герой Сав. Саюза (1981, 1985). Герой Манголіі (1981). Лётчык-касманаўт СССР (1981). Д-р тэхн. н., прафесар. Скончыў Маскоўскі ін-т інжынераў геадэзіі, аэрафотаздымкі і картаграфіі (1969). У 1978—89 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю.А.Гагарына. З 1989 рэктар Маскоўскага ун-та геадэзіі і картаграфіі. 12.3—26.5.1981 з У.В.*Кавалёнкам* здзейсніў палёт на касм. караблі (КК) «Саюз Т-4» і арбітальнай станцыі (АС) «Салют-6» (да станцыі прыстыкоўваліся КК «Саюз-39» з У.А.*Джанібекавым* і Ж.*Гурагчам* і «Саюз-40» з Л.І.*Паповым* і Д.*Прунарыў*); 6.6—21.11.1985 з Джанібекавым — на КК «Саюз Т-13» і АС «Салют-7» (пасадка на КК «Саюз Т-14»); 7—17.6.1988 з А.Я.*Салаўёвым* і А.Аляксандравым (Балгарыя) — на КК «Саюз ТМ-5» і АС «Мір» па праграме «Інтэркосмас» (пасадка на КК «Саюз ТМ-4»). Ва ўсіх палётах удзельнічаў як борт-інжынер. Правёў у космасе 252,7 сут. *У.С.Ларыёнаў.*

САВІНЫЯ, совы нармальныя, совы сапраўдныя (Strigidae), сямейства птушак атр. совападобных. 23—28 родаў, 21 выкапнёвы і 133 сучасныя віды. Пашыраны паўсюдна, ад арктычных тундраў да трапічных лясоў. У гарах трапляюцца да выш. 5 тыс. м. Гняздуюцца на зямлі, у дуплах дрэў, гнёздах інш. птушак, расколінах скал, збудаваннях. Аселыя і вандроўныя птушкі, актыўныя пераважна на змярканні і ўначы. У Чырв. кнігу МСАП занесены 3 віды і 9 падвідаў. На Беларусі 12 відаў з 9 родаў; 8 відаў у Чырв. кнізе.

Даўж. цела да 84 см, размах крылаў да 2 м, маса да 4,5 кг. Самкі буйнейшыя за самцоў. Апярэнне мяккае, рыхлае, шараватае, бурае або рыжаватае, з цёмнымі і светлымі плямамі і стракацінамі. Тварavы дыск акруглы. З органаў пачуццяў найб. развіты слых і бінакулярны зрок. Вочы вял., у арбітах нерухомыя. У многіх відаў на галаве «вушкі» з падоўжаных пёраў (відавая адзнака). Вонкавыя вушныя адтуліны вялікія. Шыйных пазванкоў 14, шыя вельмі рухавая (галава можа паварочвацца на 180—270°). Крылы шырокія, закругленыя, хвост адносна кароткі. Дзюба вострая, кароткая, крута загнутая ўніз, каля асновы з васкавіцай, якая прыкрыта шорсткімі пёркамі. Лапы моцныя, чатырохпальцыя (4-ы палец паварочваецца назад). Цэўкі ўкарочаныя, апераныя, кіпцюры гладкія. Кормяцца пераважна жывёльным кормам. Манагамы. Адкладваюць 3—6 (зрэдку да 14) яец. Развіццё птушанят па птушанятным тыпе.

Літ.: Жизнь животных. Т. 6. 2 изд. М., 1986; Никифоров М.Е., Яминский Б.В., Шкляров Л.П. Птицы Белоруссии: Справ.-определитель гнезд и яиц. Мн., 1989; Птушкі Еўропы: Палявы вызначальнік: Пер. з пол. Варшава, 2000. *А.М.Петрыкаў.*

САВІЦКАЯ Галіна Уладзіміраўна (н. 13.7.1961, Мінск), бел. спартсменка (баскетбол). Засл. майстар спорту. Скончыла БДУ і Бел. ін-т фіз. культуры. У 1980—90 выступала ў складзе зборнай каманды СССР. Бронз. прызёр XXIV Алімп. гульняў (1988, Сеул). Чэмпіёнка свету (1983), Еўропы (1980, 1981, 1983, 1985, 1987, 1989). Чэмпіёнка Сусв. універсіяды (1981). Сярэбраны прызёр чэмпіянату СССР (1989). З 1991 на трэнерскай рабоце ў Іспаніі.

САВІЦКАЯ Святлана Яўгенаўна (н. 8.8.1948, Масква), савецкі касманаўт. Двойчы Герой Сав. Саюза (1982, 1984). Лётчык-касманаўт СССР (1982). Канд. тэхн. н. (1987). Засл. майстар спорту СССР (1970). Чэмпіёнка свету па вышэйшым пілатажы (1970), устанавіла 18 сусветных рэкордаў. Дачка Я.Я.*Савіцкага*. Скончыла Маскоўскі авіяц. ін-т (1972). З 1976 лётчык-выпрабавальнік. У 1980—1993 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю.А.Гагарына. 19—27.8.1982 з Л.І.*Паповым* і А.А.*Серабровым* здзейсніла (як касманаўт-даследчык) палёт на касм. караблі (КК) «Саюз Т-7» і арбітальнай станцыі (АС) «Салют-7» (пасадка на КК «Саюз Т-5»); 17—29.7.1984 (як бортінжынер) з У.А.*Джанібекавым* і І.П.*Воўкам* — на КК «Саюз Т-12» і АС «Салют-7» (пасадка на КК «Саюз Т-11»), у час якога ўпершыню ў свеце здзейснены выхад жанчыны-касманаўта ў адкрыты космас. Правяла ў космасе 19,7 сут. Залаты медаль міжнар. авіяц. федэрацыі (ФАІ). *У.С.Ларыёнаў.*

САВІЦКІ Алесь (Аляксандр Ануфрыевіч; н. 8.1.1924, г. Полацк Віцебскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага (1958). Працаваў у полацкай газ. «Бальшавіцкі сцяг» («Сцяг камунізму»), Літ. музеі Я.Коласа, ЦК КПБ. Друкуецца з 1943. Аповесць «Кедры глядзяць на мора» (1960) пра будаўнікоў Брацкай ГЭС, раман

Алесь **Савіцкі**.

«Жанчына» (1963) пра побыт і работу працаўнікоў полацкага з-да шкловалакна. У рамане «Палын — зелле горкае» (1967) малюнкі пасляваен. калгаснай вёскі. Гал. героі аповесці «Самы высокі паверх» (1965—67, прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1972) — маладыя рабочыя. Вобразы сучаснікаў у аповесці «І нічога ўзамен» (1971) і рамане «Толькі аднойчы» (1979). Трылогія «Верай і праўдай» («Верай і праўдай», 1976; «Літасці не чакай», 1982; «Памерці заўсёды паспееш», 1983) пра партызанскі рух на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Для дзяцей і юнацтва кн. «Шкляная нітка» (1970), «Радасці і нягоды залацістага карасіка Бубліка» (1993), «Прыгоды Муркі» (1997), «Дзівосы Лысай гары...» (1999), аповесці «Скажы мне праўду» (1978), «Белая знічка» (1984).

Тв.: Выбр. творы. Т. 1—2. Мн., 1984; Выбр. творы: У 2 т. Т. 1. Мн., 1995; Верасы. Мн., 1987; Обаль. Мн., 1989. *Л.С.Савік.*

САВІЦКІ Антон (1788, Мінская губ. — 1851), бел. вучоны ў галіне анкалогіі. Д-р медыцыны (1812). Скончыў Віленскі ун-т (1812). З 1814 ваен. ўрач, з 1818 урач Вількамірскага пав. Віленскай губ. Адзін з першых на Беларусі і ў Літве напісаў дысертацыю па даследаванні рака.

САВІЦКІ Барыс Парфёнавіч (н. 25.1.1933, Мінск), бел. вучоны ў галіне заалогіі і экалогіі. Д-р біял. н. (1973), праф. (1976). Скончыў БДУ (1955). З 1974 у Гомельскім ун-це (заг. кафедры), з 1990 у Вярх. Савеце Беларусі (член Прэзідыума, старшыня камісіі), з 1996 у Ін-це заалогіі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па экалогіі ўзбуджальнікаў асабліва небяспечных інфекцый, фауне і экалогіі кровасысучых членістаногіх, агульнай экалогіі, змене фауны пад уплывам меліярацыі, ахове прыроды.

Тв.: Трансмиссивные зоонозы в Гомельской области. Мозырь, 1999 (разам з Л.С.Цвірко); Популяционно-генетические ресурсы пихты белой в Беларуси. Гомель, 2000 (разам з Р.Р.Ганчарэнкам).

1

2

3

Савіньи: 1 — сава акулярная неатрапічная; 2 — пугач амерыканскі; 3 — соўка ашыйнікавая; 4 — сава ястрабіная.

САВІЦКІ Валянцін Мікалаевіч (н. 27.9.1919, в. Звянячы Талачынскага р-на Віцебскай вобл.), бел. жывапісец. Скончыў Віцебскае маст. вучылішча (1939). Працуе ў галіне тэматычнай карціны, партрэта, пейзажа. Сярод твораў: «Вечар над Нёманам» (1949), «М.В.Фрунзе ў штабе Заходняга фронту» (1957), «Занёманскія будні» (1963), «У гады вайны» (1965), «Гродна. Каложа» (1967), «Вуліца першых дэманстрацый» (1969), «Свяшчэнныя камяні» (1975), «Ізумруд палёў» (1971), «Абнаўленне зямлі» (1977), «Партызаны-падрыўнікі» (1980), «На Нёмане» (1981), «Салдаты крэпасці» (1988), «Асенняя цішыня» (1997), «Год 1941» (1998), «Дні юнацтва майго пакалення» (1999), «Успаміны» (2000). Для твораў характэрны пастозная манера пісьма, сакавіты каларыт, выразнасць дэталей карціны.

В.Савіцкі. М.В.Фрунзе ў штабе Заходняга фронту. 1957.

САВІЦКІ Вацлаў Іванавіч (н. 1.10.1931, в. Вітаўцы Вілейскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне хірургіі. Д-р мед. н. (1972), праф. (1976). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1956). У 1963—77 у Гродзенскім мед. ін-це. Навук. працы па праблемных пытаннях хірургіі сэрца і сасудаў.

Тв.: Профилактика и лечение послеоперационных осложнений у больных митральным стенозом // Здравоохранение Белоруссии. 1965. № 4; Определение активности ревмокардита у больных с митральным стенозом // Материалы VII науч. сессии Гродн. гос. мед. ин-та. Мн., 1968.

САВІЦКІ Георгій Канстанцінавіч (6.11.1887, С.-Пецярбург — 13.8.1949), расійскі жывапісец і графік. Сын К.А.*Савіцкага*. Правадз. чл. АМ СССР (1949). Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1908—15). Чл. Асацыяцыі мастакоў рэв. Расіі (з 1922). З 1947 выкладаў у Маскоўскім маст. ін-це. Аўтар гіст., батальных і жанравых карцін («Апошні дзень Троі», 1915; «1919 год», 1921; «Снежань у Маскве», 1925; «На манеўрах», 1938), партрэтаў, пейзажаў, ілюстрацый да кніг. Удзельнічаў у стварэнні панарамы «Штурм Перакопа» (1934—38), у выпуску *«Окон ТАСС»* (1941—42). Дзярж. прэмія СССР 1942.

Тв.: Молодым художникам о мастерстве. М., 1952.

Літ.: Полищук Э.А. Г.К.Савицкий. М., 1961.

САВІЦКІ Канстанцін Апалонавіч (6.6.1844, г. Таганрог, Расія — 13.2.1905), рускі жывапісец. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1862—73). Правадз. чл. Пецярб. АМ (з 1895). Чл. Т-ва перасоўных маст. выставак (1878, гл. *Перасоўнікі*). З 1891 выкладаў у Маскоўскім вучылішчы жывапісу, з 1897 у Пензенскім маст. вучылішчы (дырэктар). Для творчасці характэрны выкрывальная скіраванасць, імкненне перадаць складаную псіхалогію і выразнасць нар. тыпажу, майстэрства кампаноўкі шматфігурных сцэн. Пісаў пераважна жанравыя карціны: «Рамонтныя работы на чыгунцы» (1874), «Сустрэча абраза» (1878). У шэрагу твораў сцэны нар. жыцця набываюць трагедыйнае гучанне («На вайну», 1880—88), перадаюць вастрыню сац. канфлікту («Спрэчка на мяжы», 1897). Аўтар ілюстрацый, афортаў, літаграфій.

Літ.: Левенфиш Е.Г. К.А.Савицкий, 1844—1905. Л.; М., 1959.

САВІЦКІ Маркел Сцяпанавіч (19.6.1898, в. Расасна Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. — 24.7.1975), бел. вучоны ў галіне раслінаводства. Д-р с.-г. н. (1962), праф. (1963). Засл. дз. нав. Беларусі (1965). Скончыў Маскоўскую с.-г. акадэмію (1924). З 1963 заг. кафедры БСГА. Навук. працы па агратэхніцы збожжавых культур. Прапанаваў структурную формулу ўраджайнасці палявых культур, распрацаваў методыку норм высеву збожжавых культур па аптымальным сцебластоі.

Тв.: Биологические и агрономические основы формирования высоких урожаев зерновых культур. М., 1968; Теоретические основы методики определения норм высева зерновых культур по оптимальному стеблестою // Нормы высева, способы посева и площади питания сельскохозяйственных культур. М., 1971.

САВІЦКІ Мікалай Іванавіч (н. 4.2.1934, в. Паўлаўшчына Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне эканомікі. Канд. эканам. н. (1963), праф. (1982). Скончыў Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1957). З 1964 у Бел. эканам. ун-це (у 1965—86 заг. кафедры). Навук. працы па эканам. інфарматыцы, праграмаванні, тэхналогіі захоўвання і апрацоўкі звестак, аўтаматызацыі ўліку.

Тв.: Техника вычислений и механизация учета. 3 изд. М., 1979; Вычислительные машины и программирование. 2 изд. Мн., 1980; Руска-беларуска-англійскі слоўнік па інфарматыцы і вылічальнай тэхніцы. Мн., 1992; Эканамічная інфарматыка і вылічальная тэхніка. Мн., 1996; Тэхналогіі арганізацыі, захоўвання і апрацоўкі звестак. Мн., 2000.

САВІЦКІ Міхаіл Андрэевіч (н. 18.2.1922, в. Звянячы Талачынскага р-на Віцебскай вобл.), бел. мастак. Нар. маст. Беларусі (1972). Нар. маст. СССР (1983). Правадз. чл. АМ Расіі (1982). Акад. Нац. АН Беларусі (1995). Скончыў Маст. ін-т імя Сурыкава ў Маскве (1957). У Вял. Айч. вайну ўдзельнік абароны Севастопаля, быў вязнем канцлагераў Бухенвальд, Дахау, Дора, Мітэльбау. З 1980 кіраўнік Творчых майстэрняў жывапісу АМ СССР у Мінску (з 1991 Творчыя акад. майстэрні Мін-ва культуры Беларусі). Працуе ў галіне станковага і манум. жывапісу. Творчасць вызначаецца глыбокім пранікненнем у сутнасць з'яў мінулага і сучаснасці, іх філас. асэнсаваннем, сцвярджэннем вечных духоўных каштоўнасцей чалавецтва. У аснове твораў ваен. тэматыкі асабістыя ўражанні ад гераічнай барацьбы народа супраць ням. акупантаў, злачынстваў фашыстаў супраць чалавецтва. Аўтар прасякнутых антыфаш. пафасам і публіцыстычнасцю жывапісных твораў, прысвечаных партыз. барацьбе: «Партызаны» (1963), «Партызанская мадонна», «Віцебскія вароты» (абодва 1967), «За-

Г.Савіцкі. Снежань у Маскве. 1925.

К.Савіцкі. Рамонтныя работы на чыгунцы. 1874.

бойства сям'і партызана» (1972), «Плач па загінуўшых героях» (1974). Упершыню ў сав. мастацтве праз колеравае і кампазіцыйнае вырашэнне, лаканізм маст. мовы, вобразнасць увасобіў трагізм, які зазнала чалавецтва ў гады фаш. акупацыі: карціна «Партызаны. Блакада» (1966—67), серыі «Лічбы на сэрцы» (1974—87) і інш. Глыбокім эпічным гучаннем вызначаецца твор «Поле» (1974).

М.А.Савіцкі.

чар»). Гал. месца ў творчасці 1990—2001 займае хрысціянская тэматыка. У работах на гэту тэму мастак увасобіў пошукі і сродкі, здольныя перадаць сучаснае бачанне «вечна сучасных» падзей, па-філасофску пераасэнсаваную штодзённасць, глабальнае ўсведамленне праблем. сусв. і адначасова прыватных: «Зняцце з крыжа», «Уцёкі ў Егіпет», «Сялянская п'ета», «Спакушэнне Іуды», «Нясенне крыжа», «Іоў». Серыя «Запаветы блажэнстваў» (1991—2001) блізкая па духу да біблейскіх карцін, выяўляе складаныя псіхал. калізіі сучаснага быцця, праз кампазіцыйнае вырашэнне і напружаны каларыт раскрываецца гал. ідэя гэтай серыі — адлюстраванне спакутаваных людзей, якія заслугоўваюць раю. Вобразнасцю, філас. фундаментальнасцю, глыбокім сац. зместам вылучаюцца творы «Без весткі прапаўшыя» (1991), «Вяртанне» (1998), «Сейбіт» (1999), «Прыбранае поле», «XX стагоддзе — забойства праўды» (абедзве 2001) і інш. Маштабнасць і сімвалічнасць маст. мовы характэрны для твораў у манум. мастацтве: размалёўкі «Вялікая Айчынная вайна. 1944» у Бел. дзярж. музеі гісторыі Вял. Айч. вайны ў Мінску (1971; Дзярж. прэмія СССР 1973) і «Эстафета пакаленняў» у санаторыі «Беларусь» у Місхоры (Украіна, 1973), габелены для залы пасяджэнняў ЦК КПБ (цяпер рэзідэнцыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, 1978—79, дзве апошнія з А.Кішчанкам). Дзярж. прэмія Беларусі 1970, 1980, 1998.

Літ.: Назімава І.В. М.А.Савіцкі. Мн., 1973; Пугачева Э.Н. Михаил Савицкий. Мн., 1982; М.Савицкий: Белоруссия — земля партизанская: [Альбом]. М., 1977; М.Савицкий: Живопись: [Альбом]. Мн., 1996.

А.М.Савіцкі.

М.**Савіцкі**. Поле. 1974.

САВІЦКІ Сцяпан Еўдакімавіч (3.6.1923, в. Вялікая Сліва Слуцкага р-на Мінскай вобл. — 11.3.1996), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі шкла і сілікатаў. Канд. тэхн. н. (1955), праф. (1971). Скончыў БПІ (1951). З 1960 у Бел. ін-це нар. гаспадаркі (заг. кафедры). З 1965 у Віцебскім тэхнал. ін-це лёгкай прам-сці (у 1965—88 рэктар). Навук. працы па агульнай хіміі, фіз. хіміі сілікатаў, тэхналогіі шкла і хім. апрацоўкі металаў.

Тв.: Исследование полидисперсных систем физическими методами. Мн., 1971 (у сааўт.); Химическое фрезерование. Мн., 1973 (у сааўт.).

САВІЦКІ Уладзімір Іларыёнавіч (28.6.1914, в. Добасна Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. — 14.2.1989), бел. пісьменнік. Скончыў Ленінградскі тэкстыльны ін-т (1937). Друкаваўся з 1941. Пісаў пераважна на рус. мове. Асн. тэмы кн. апавяд. «Ноч перад парадам» (1970), аповесцей «Не зрабі зла бліжняму» (1974), «Улька» (1981), зб-каў дакумент. апавяд. «Ні хвіліны спакою» (1973), «А гады ідуць...» (1984), рамана «І прыйдзе твой дзень» (1977) і інш. — Вял. Айч. вайна, лёс бел. вёскі. Аўтар зб-каў вершаў «Поле бою» (1963), «Зарніцы на гарызонце» (1985).

Тв.: Аленушка из Долгих Нив: Повести. Мн., 1989.

САВІЦКІ Эдуард Міхайлавіч (н. 4.3.1935, г. Буда-Кашалёва Гомельскай вобл.), бел. гісторык-архівіст. Д-р гіст. н. (1992), праф. (1997). Скончыў Маскоўскі гісторыка-архіўны ін-т (1959). З 1959 у Цэнтр. гіст. архіве Беларусі (з 1964 нам. дырэктара). З 1968 у выд-ве «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя», з 1973 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору і з 1977 у Ін-це гісторыі АН Беларусі, з 1982 у Бел. ін-це нар. гаспадаркі, з 1987 у Мінскім мед. ін-це. З 1990 нам. нач. Гал. архіўнага ўпраўлення, з 1992 нам. старшыні к-та па архівах і справаводстве Беларусі, у 1996—2001 нам. дырэктара Бел. н.-д. ін-та дакументазнаўства і архіўнай справы. Даследуе праблемы сял., рабочага і рэв. руху, развіцця сельскай гаспадаркі і прам-сці Беларусі 19 — пач.



М.**Савіцкі**. Зняцце з крыжа. 1993.

Значнае месца ў творчасці С. займаюць партрэты, адметныя глыбокім пранікненнем у сутнасны стан чалавека, раскрыццём псіхалагізму праз выкарыстанне мінімальных сродкаў выяўлення: «Жаночы партрэт» (1966), «Сейбіты» (1972), «Віленскія сустрэчы» (1976), «Янка Купала» (1979), «Сям'я» (1980), «Пушкін і Ганчарова» (1986), «Дастаеўскі» (1988), «Філосафы» (1994), «Аўтапартрэт» (1995), «А.Пушкін і А.Міцкевіч» (2000), партрэты прэзідэнтаў АН Беларусі (М.Барысевіча, А.Вайтовіча, К.Горава, П.Горына, М.Грашчанкава, А.Жэбрака, У.Ігнатоўскага, В.Купрэвіча, У.Платонава, І.Сурты, Л.Сушчэні, 1998—2001). У серыі «Чорная быль» (1986—93; залаты медаль АМ СССР 1992) з высокай маст. пераканаўчасцю адлюстравана шматграннасць Чарнобыльскай катастрофы. У 10 карцінах мастак перадаў усе бакі трагедыі («Плач аб зямлі», «Пакінутыя», «Доля», «Чарнобыльская мадонна», «Відушчы», «Эвакуацыя», «Настальгія», «Крыж надзеі», «Забароненая зона», «Ве-

20 ст. Адзін з аўтараў «Гісторыі рабочага класа Беларускай ССР» (т. 1. 1984). Складальнік зб. дакументаў і матэрыялаў «Бунд у Беларусі, 1897—1921» (1997).

Тв.: Революционное движение в Белоруссии (август 1914 — февраль 1917 гг.). Мн., 1981; Рабочее движение в Беларуси (июнь 1907 — февраль 1917 гг.). Мн., 1995.

М.М.Смальянінаў.

Я.Я.**Савіцкі**.

САВІ́ЦКІ Яўген Якаўлевіч (24.12.1910, г. Новарасійск, Расія — 6.4.1990), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, двойчы Герой Сав. Саюза (1944, 1945), маршал авіяцыі (1961). Засл. ваен. лётчык СССР (1965). Скончыў Ваен. школу лётчыкаў (1932), Ваен. акадэмію Генштаба (1955). У Чырв. Арміі з 1929. У Вял. Айч. вайну з 1942 на Варонежскім, Паўд.-Зах., Сталінградскім, Паўн.-Каўказскім, Паўд., 4-м Укр., 1-м і 3-м Бел. франтах: камандзір знішчальнай авіядывізіі, камандуючы авіягрупамі, камандзір знішчальнага авіякорпуса. Зрабіў 216 баявых вылетаў, правёў 81 паветр. бой, збіў 22 самалёты праціўніка. З 1948 на кіруючых пасадах у ППА Сав. Арміі.

СА́ВІЧ Аляксандр Антонавіч (13.3.1890, в. Лапеніца Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. — 22.10.1957), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1937), праф. (1928). Скончыў Пецярбургскую правасл. духоўную акадэмію (1914) і Маскоўскі ун-т (1917). З 1921 у Мінску, чл. Архіўнай камісіі Акадэмцэнтра пры Наркамасвеце БССР (гл. *Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасці*). Выкладаў у БДУ (1921—23, 1944—47), Пермскім ун-це, пед. ін-тах Яраслаўля і Масквы. З 1930-х г. у Дзярж. гіст. музеі Ін-та гісторыі АН СССР. Доктарская дысертацыя па дачыненнях Рас. дзяржавы з Рэччу Паспалітай у час смуты 1600—19. Асэнсоўваючы гісторыю Беларусі, паступова адыходзіў ад пазіцый заходнерусізму, схіляўся да нац.-дзярж. канцэпцыі. 17.6.1922 разам з патрыятычна настроенымі правасл. святарамі і прадстаўнікамі бел. інтэлігенцыі падпісаў адозву да правасл. беларусаў з заклікам стварэння нац. (аўтакефальнай) правасл. царквы Беларусі. У 1923 абвінавачаны ў антысавецкай дзейнасці, арыштаваны і сасланы ў г. Перм. У 1944 вярнуўся ў Мінск. Даследаваў пытанні сац.-эканам. развіцця Рас. дзяржавы ў сярэдневякоўі, гісторыю яе адносін з ВКЛ і Рэччу Паспалітай у 15—17 ст., гісторыю асветы і грамадска-паліт. думкі ў краінах Усх. Еўропы 16—19 ст. і інш.

Тв.: Униатские школы для западнорусского юношества до Брестской церковной унии // Тр. БГУ. 1922. № 1; Западнорусские униатские школы XVII—XVIII вв. // Там жа. № 2—3; Борьба за Белоруссию и Украину в 1654—1667 гг. // Уч. зап. Моск. гор. пед. ин-та. 1947. Т. 2, вып. 2. *У.В.Ляхоўскі.*

СА́ВІЧ Уладзімір Ільіч (16.4.1932, в. Яснаўка Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 15.12.1989), бел. вучоны ў галіне судовай медыцыны. Д-р мед. н. (1974), праф. (1982). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1957). З 1962 у Бел. НДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі, з 1976 у Мінскім мед. ін-це (заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях паталогіі, у т.л. сасудзістай, галаўнога мозга, нейраанкалогіі, выніках траўматычных пашкоджанняў нерв. сістэмы, метадах комплекснага вывучэння магістральных артэрый галавы.

Тв.: О компенсации двигательных функций после удаления опухолей головного мозга // Проблемы сосудистой нейрохирургии. Мн., 1962; Динамика морфологических изменений в области окклюзированных магистральных артерий головы при инфаркте мозга // Актуальные вопросы невропатологии и нейрохирургии. Мн., 1975. Вып. 8. *А.Б.Мельнічэнка.*

СА́ВІЧ Уладзімір Пятровіч (н. 16.4.1952, в. Акцябр Лагойскага р-на Мінскай вобл.), бел. графік. Засл. дз. маст. Беларусі (1990). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1976). З 1976 выкладае ў Бел. АМ (з 1996 праф.). Працуе ў станковай і кніжнай графіцы. У станковых творах ярка выяўлены графічныя інтэрпрэтацыі і пераасэнсаванне традыц. нар. культуры ў сучасных маст. формах, філасафічнасць; значная ўвага аддаецца глыбокай танальна-каларыстычнай

У.**Савіч**. У крузе магічных абрадаў. 1996.

прапрацоўцы: серыі «Беларускія мадонны» (1970), «Этнографы» (1978), «Маці-Бацькаўшчына» (1983); лісты «Зіма. Стары гасцінец», «Аздаміцкі святы», «Памяць старых курганоў», «Тут вакол мая памяць», «Аздамічы. Час медазбору» (усе 1988), «Сон зямлі» (1990), «Легенда старога замка» (1993), «Далёкае — блізкае», «Князь» (абодва 1994), «Каўчэг захаваных свят», «У крузе магічных абрадаў», «Шэсце», «Святасць споведзі» (усе 1996), «Перакрыжаванні», «Гуканне вясны» (абодва 1998), «Вобраз складкі», «Рух з запасам цішыні», «Анёл сноў» (усе 1999), «Той, хто носіць сваю дарогу», «У пошуку згубленага часу» (абодва 2000), «Разарваныя фрагменты памяці», «Жывапіс для ветру», «Вярнуцца, каб ізноў вярнуцца» (усе 2001). У кніжнай графіцы арганічна спалучае графічныя элементы з выразнымі сродкамі друкарскага набору. Афарміў кнігі «Міхасёвы прыгоды» Я.Коласа (1980), «Казка пра суседзяў, змяю і мядзведзя» Н.Мацяш (1982), «Творы» В.Дуніна-Марцінкевіча, «Госці» В.Віткі, «Малы-малышок» (усе 1984), «Родныя дзеці» Н.Гілевіча, «З рога ўсяго многа» (абедзве 1985), «Выбранае» Цёткі (1986) і інш. Аўтар серый акварэляў «Голас Янкі Купалы» (1982), «Па Міншчыне» (1983), «Палессе» (1984).

Літ.: Баразна М.Р.Беларуская кніжная графіка 1960—1990-х г. Мн., 2001.

М.Р.Баразна.

СА́ВІЧ Усевалад Паўлавіч (19.2.1885, г. Бабруйск Магілёўскай вобл. — 25.5.1972), бел. і расійскі вучоны ў галіне ліхеналогіі. Д-р біял. н., прафесар. Засл. дз. нав. Расіі. Вучань У.Л.*Камарова*. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1912). З 1922 нам. дырэктара, з 1925 вучоны сакратар Гал. бат. саду Расіі; у 1932—37 нам. дырэктара, у 1932—60 кіраўнік аддзела Бат. ін-та імя У.Л.Камарова АН СССР. Удзельнік навук. экспедыцый, у т.л. 1907—10 — Камчацкай, у 1923—25 — Беларускай, у 1930 — Арктычнай (на ледаколе «Седов» на а-вы Новая Зямля, Зямля Франца-Іосіфа, Паўн. Зямля). Навук. працы па марфалогіі, экалогіі, сістэматыцы споравых раслін (гал. чынам лішайнікаў), выкарыстанні іх у медыцыне і нар. гаспадарцы.

Тв.: Результат лихенологических исследований 1923 г. в Белоруссии // Зап. Бел. гос. ин-та сел. и лесного хозяйства. Мн., 1925. Вып. 4; По Южной Белоруссии: Наблюдения при ботанич. экскурсии (разам з Г.М.Высоцкім, Л.І.Савіч) // Там жа. *У.У.Галубкоў.*

СА́ВІЧ Франц Андрэевіч (каля 1815, в. Вяляшчы Пінскага р-на Брэсцкай вобл. — каля 1845), бел. паэт, публіцыст, рэвалюцыянер-дэмакрат. Скончыў Пінскае павятовае вучылішча (1833). Вучыўся ў Віленскай медыка-хірург. акадэміі (1833—38). Арганізаваў там нелегальнае рэв. *Дэмакратычнае таварыства*. У 1837 наладзіў сувязь з Ш.Канарскім, з сябрамі ўступіў у яго Садружнасць польскага народа (гл. *Саюз польскага народа*). Арыштаваны (1838) і высланы (1839) у салдаты на Каўказ. У 1841 уцёк, быў злоўлены, каля 2 гадоў прася-

дзеў у турме Цірaспаля (цяпер Рэспубліка Малдова) пад чужым імем. Аддадзены паўторна на вайсковую службу, зноў уцёк. Вясной 1844 дабраўся да Кіева. Жыў пад імем доктара Гельгега ў мяст. Янушпаль (каля Бярдзічава, Украіна). Заразіўся халерай. Аўтар статута «Прынцыпы дэмакратызму», праклamацыі «Заўвагі на маральную вайну народа з дэспатызмам» (адзін з першых паліт. памфлетаў у гісторыі вызв. руху на Беларусі), мемуараў (апубл. 1876). Яго беларускамоўны верш «Там блізка Пінска...», апубл. ў мемуарах Э.Паўловіча «Успаміны з-над Вілii і Нёмана» (1882), прасякнуты антыпрыгонніцкімі матывамі.

Тв.: У кн.: Беларуская літаратура XIX ст.: Хрэстаматыя. 2 выд. Мн., 1988.

Літ.: Смірноў А. Франц Савіч. Мн., 1961; Мохнач Н.Н. Идейная борьба в Белоруссии в 30—40-е гг. XIX в. Мн., 1971; Александровіч С. Слова — багацце. Мн., 1981. *І.У.Саламевіч.*

САВІЧ-ЗАБЛО́ЦКІ (Суліма-Савіч-Заблоцкі) Войслаў (Вайніслаў) Казімір Канстанцінавіч [15.3.1850 (паводле інш. звестак у 1849), маёнтак Панчаны Міёрскага р-на Віцебскай вобл. — пасля 1893], бел. і польскі паэт, празаік, публіцыст. Пісаў на бел., польскай, франц. і рус. мовах. Вучыўся ў Віленскай гімназіі, ун-тах Прагі, Лейпцыга, Страсбурга. Рана пранікся ідэямі вызв. руху і нац. абуджэння бел. народа. З 1868 у нац.-асветнай суполцы «Крывіцкі вязок» (Пецярбург, яе кіраўнік). Суполку забаранілі, а С.-З. апынуўся пад наглядам паліцыі ў Варшаве. Апублікаваў сатыр. паэму на польскай мове «Праўдападобная гісторыя» (1871), гіст. творы пра М. Каперніка (1873). З 1875 за мяжою (Аўстра-Венгрыя, Германія, Егіпет, Францыя, Бельгія). Выдаваў газеты на польскай і франц. мовах. Супрацоўнічаў у многіх франц., ням. і польскіх газетах і часопісах. У 1887 вярнуўся на радзіму. Працаваў у рэдакцыі газ. «Виленский вестник» (1888—89). У 1889—91 жыў у маёнтку Губіна Лепельскага пав. З 1891 у Мінску, пасля ў Пецярбургу. Перапісваўся з Я.Карловічам, М.Канапніцкай, А.Ельскім, М.Драгаманавым, П.Лаўровым і інш. Польскамоўная паэма «Аповесць пра мае часы» (1876) пра Беларусь пярэдадня 1863. Аўтар аповесці «Полацкая шляхта» (1885). Рукапісы і дакументы С.-З. ў архівах і б-ках Мінска, Вільнюса, Масквы, С.-Пецярбурга, Львова, Варшавы, Кракава і інш.

Тв.: У кн.: Беларуская літаратура XIX ст.: Хрэстаматыя. 2 выд. Мн., 1988.

Літ.: Мальдзіс А. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974; Пачынальнікі. Мн., 1977; Янушкевіч Я. У прадчуванні знаходак. Мн., 1994. *Г.В.Кісялёў.*

САВІЧЫ, вёска ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл., на аўтадарозе Калінкавічы—Колкі. Цэнтр сельсавета і калект. с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 46 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Калінкавічы, 168 км ад Гомеля. 615 ж., 231 двор (2001). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

САВО́ЙСКАЕ ГЕ́РЦАГСТВА, дзяржава ў 1416—1720 (у 11 ст. — 1416 мела статус графства) са сталіцай у Шамберы (цяпер тэр. Францыі), з 1563 — у Турыне (цяпер тэр. Італіі). У склад С.г. ўваходзіў *П'емонт*. З сярэдзіны 15 ст. — аб'ект экспансіі Францыі. У 16—17 ст. як пагранічная дзяржава разбурана войнамі *Габсбургаў* з Францыяй за Італію. У войнах за *Іспанскую спадчыну* першапачаткова саюзнік Францыі, з 1703 — «Свяшчэннай Рым. імперыі». Паводле *Утрэхцкага міру 1713* савойскі герцаг Віктар Амедэй II атрымаў тэр. Манферата, ч. герцагства Міланскага і Сіцылію. Паводле Лонданскага пагаднення 1720 да С.г. замест Сіцыліі, страчанай у 1718, перайшла Сардзінія. У выніку стварылася *Сардзінскае каралеўства*, яго каралём стаў апошні герцаг савойскі Віктар Амедэй II. Цяпер *Савояй* называецца частка тэр. б. С.г. вакол г. Шамберы.

САВО́ЙСКАЯ ДЫНА́СТЫЯ, дынастыя правіцеляў Савоі (графаў у 11 ст. — 1416, герцагаў у 1416—1720, гл. *Савойскае герцагства*), каралёў *Сардзінскага каралеўства* (у 1720—1861) і аб'яднанага каралеўства Італіі (у 1861—1946). Першым графам быў Гумберт Белая рука (памёр у 1042 ці 1051). Каралі Сардзінскага каралеўства: Віктар Амедэй II [1720—30], Карл Эмануіл III [1730—73], Віктар Амедэй III [1773—96], Карл Эмануіл IV [1796—1802], Віктар Эмануіл I [1802—21], Карл Фелікс [1821—31], Карл Альберт [1831—49], *Віктар Эмануіл II* [1849—61, з 1861 кароль аб'яднанай Італіі]. Каралі Італіі: Віктар Эмануіл II [1861—78], Умберта I [1878—1900], *Віктар Эмануіл III* [1900—1946], Умберта II [1946, у 1944—46 каралеўскі намеснік].

САВО́ЙСКАЯ КАПУ́СТА, гл. ў арт. *Капуста*.

САВО́Я (Savoie), гістарычная вобласць на ПдУ Францыі, у Савойскіх Альпах. Уключае дэпартаменты Савоя і Верхняя Савоя. Пл. 10,4 тыс. км². Нас. каля 1 млн. чал. (2000). Гал. горад — Шамберы. Рэльеф горны. У гарах лясы з дубу і каштану, вышэй — хвойныя лясы і альпійскія лугі. Клімат умераны, вышэй за 2000 м — халодны. Раён развітой прам-сці (ГЭС, электрахім. і электраметалургічная, дрэваапр., папяровая, станкабуд., гарбарная) і турызму (базы зімовага спорту, курорты Шамані, Эвіян-ле-Бэн і інш.). Гадуюць буйн. раг. жывёлу і авечак. Выраб сыроў. У далінах пасевы пшаніцы, бульбы, фуражных культур, сады і вінаграднікі.

САВУ́ЦІН Петр Мацвеевіч (23.2.1923, в. Вялікае Сяло Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. — 24.7.1995), поўны кавалер ордэна Славы. У Вял. Айч. вайну з 1943 на Цэнтр., Бел., 1-м Бел. франтах. Пам. камандзіра ўзвода разведкі ст. сяржант С. вызначыўся ў 1945 у наступальных баях на тэр. Польшчы і Германіі. Пасля вайны працаваў у рачным параходстве.

САВУШКІН Ігар Аляксандравіч (н. 5.6.1935, Масква), бел. вучоны ў галіне ядз. энергетыкі. Д-р тэхн. н. (2000). Скончыў Маскоўскі інж.-фіз. ін-т (1959). У 1963—75 і з 1983 у Ін-це ядз. энергетыкі АН Беларусі (з 1983 заг. аддзела). У 1975—83 у Мінскім пед. ін-це. З 1992 у Ін-це праблем энергетыкі Нац. АН Беларусі (заг. аддзела, з 1996 заг. лабараторыі). Навук. працы па фізіцы ядз. рэактараў, ізатопных тэхналогіях, радыяцыйным маніторынгу і ахове навакольнага асяроддзя. Распрацаваў безадходную тэхналогію атрымання радыефармакалагічнага прэпарату «Тэхнецый-99м».

Тв.: Прикладная ядерная физика. Мн., 1980 (разам з А.К.Красіным, Я.П.Пятраевым); Радиационно-химическая очистка сточных вод и выбросных газов. Мн., 1985 (разам з Я.П.Пятраевым, В.І.Уласавай); Основы экологически чистой технологии получения технеция-99m. Мн., 2000.

СА́ГА (стараж.-сканд. saga ад segia казаць, гаварыць), старажытна-ісландскія празаічныя апавяданні. Захаваліся ў запісах 2-й пал. 12—14 ст. Адрозніваюць 3 віды С. Найб. своеасаблівыя з іх т.зв. родавыя С., ці «сагі аб ісландцах». Для іх характэрны гіст. і быт. рэалізм, эпічная прастата, глыбокі псіхалагізм. Асн. сюжэт — родавыя разлады. Аўтарства гэтых С. не выяўлена. Захаваліся С. пра каралёў Нарвегіі, сярод іх аўтараў — С.Стурлусан і С.Тордарсан. Крыніцамі для іх паслужылі легенды, паэзія скальдаў, апавяданні сведкаў падзей, дакументы. С. пра епіскапаў, правадыроў Ісландыі падобны да хронік і напісаны сведкамі тагачасных падзей. У іх заўважаюцца рэліг.-маралістычныя тэндэнцыі. Рыцарскімі С. наз. празаічныя пераклады *рыцарскіх раманаў*. Слова «С.» выкарыстоўваецца таксама ў бел. і рус. перакладзе ў дачыненні да ірл. эпасу.

«СА́ГА АБ ЭЙМУНДЗЕ», «Пасма аб Эймундзе Хрынгсане», ісландская сага канца 13 ст., у якой найбольш звестак пра Стараж. Русь, у т.л. пра землі сучаснай Беларусі. Паведамляе пра княжацкую барацьбу пасля смерці вял. кн. Уладзіміра Святаславіча (1015) з удзелам наўгародскага кн. Яраслава Мудрага, тураўскага кн. Святаполка Акаяннага, полацкага кн. Брачыслава Ізяславіча і варажскіх конунгаў з дружынамі. Змяшчае шмат звестак, якія адсутнічаюць у стараж.-рус. летапісах або супярэчаць ім (напр., сведчыць, што кн. Барыс быў забіты Яраславам, а не Святаполкам; вораг Эймунд княжыў у Полацку, і інш.). У гістарыяграфіі існуюць супярэчлівыя погляды на верагоднасць звестак сагі.

Літ.: Филист Г.М. История «преступлений» Святополка Окаянного. Мн., 1990;

Джаксон Т.Н. Исландские королевские саги о Восточной Европе (первая треть XI в.): Тексты. Перевод. Коммент. М., 1994.

САГАЙДА́К, сайдак (цюрк.), камплект (набор) ручной *кідальнай зброі* коннага воіна. Выкарыстоўваўся з 5—6 ст. Атрымаў пашырэнне ў манголаў і цюрк. народаў у 10—19 ст., у некат. інш. народаў, у т.л. ў Расіі ў 13—17 ст. Складаўся з *лука* з налуччам, *стрэл* з *калчанам* і тахтуя (чахол). У налучча ўстаўляўся лук, у калчан — стрэлы. Налучча прымацоўвалася разам з шабляй да пояса з левага боку, а калчан — з правага. Тахтуй, які нацягвалі ў паходзе на калчан, служыў для засцярогі стрэл ад вільгаці.

Сагайдак: 1 — лук; 2 — налучча; 3 — стрэлы; 4 — калчан.

САГАЙДА́КЕРЫ, конныя воіны-лучнікі, якія мелі на ўзбраенні *сагайдакі* (лук і стрэлы з калчанам). У 10—17 ст. уваходзілі ў склад войска манголаў, татараў (у т.л. тат. вайск. фарміраванняў у арміі ВКЛ), у 16—18 ст. — запарожскіх казакоў.

САГАЙДА́ЧНЫ (Канашэвіч-Сагайдачны) Пётр Конанавіч (? с. Кульчыцы Самбарскага р-на Львоўскай вобл., Украіна — 30.4.1622), палітычны і ваенны дзеяч Украіны, гетман рэестравага казацтва. З 1601 у *Запарожскай Сечы*. Удзельнік і кіраўнік паходаў укр. казакоў супраць Крымскага ханства і Турцыі (1614, 1615, 1616 і інш.). У 1616 казакі напалі на Кафу (Феадосію), дзе вызвалілі шмат нявольнікаў, штурмам авалодалі тур. гарадамі Сінопам і Трапезундам. Удзельнічаў у паходзе польск. каралевіча Уладзіслава ў 1618 на Маскву. Выступаў супраць нац. і рэліг. ўціску на Украіне, садзейнічаў у 1620 аднаўленню правасл. іерархіі, скасаванай пасля *Брэсцкай уніі 1596*. Клапаціўся пра развіццё ўкр. культуры, уступіў з усім Запарожскім войскам у Кіеўскае брацтва. Быў прыхільнікам збліжэння з Расіяй. У 1620 накіраваў паслоў да рас. цара з прапановай прыняць укр. казакоў на рас. службу. Памёр ад ран, атрыманых у баях пад Хацінам у 1621. Гл. таксама *Польска-турэцкія войны 17 ст.*

Літ.: Голобуцкий В.А. Запорожское казачество. Киев, 1957; Гуслистий К.Г. Петро Конашевич-Сагайдачний // Укр. іст. журн. 1972. № 4.

САГА́Н (Sagan) Франсуаза (н. 21.6.1935, г. Кажарк, Францыя), французская пісьменніца. Вучылася ў Сарбоне. Зведала ўплыў М.Пруста, А.Жыда. Тыповы персанаж раманаў «Дзень добры, смутак» (1954, экранізаваны ў 1957), «Ці любіце вы Брамса?» (1959, экранізаваны ў 1961), «Крыху сонца ў халоднай вадзе» (1969), «Сінякі на душы» (1972), «Згублены профіль» (1974), «Надакучыла трываць» (1985), «Рыбіна кроў» (1987), «Павадок» (1989) і інш. — жанчына ў пошуках кахання, паразумення і шчасця. Яе творы адметныя аўтабіяграфічнасцю, паглыбленасцю ў душэўнадухоўны свет гераіні, драматызмам сітуацый, лірызмам. Аўтар шэрагу п'ес, у т.л. «Скрыпкі часам...» (1962), «Бэзавая сукенка Валянціны» (1963), «Піяніна ў траве» (1966), зб. навел «Аксамітавыя вочы» (1975), шматлікіх эсэ, кніг успамінаў. На бел. мову асобныя яе навелы пераклаў Л.Казыра. У Брэсцкім т-ры драмы і музыкі пастаўлена п'еса «Калі конь траціць прытомнасць» (1993).

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Французская навела XX ст. Мн., 1992; Рус. пер. — Избр. произв. Т. 1—4. М., 1992—93; Ангел-хранитель: Романы, эссе. М., 1999; Приблуда. М., 1999.

Літ.: Уваров Ю.П. Современный французский роман, 60—80-е гг. М., 1985.

Е.А.Лявонава.

САГАРМА́ТХА, адна з мясцовых назваў г. *Джамалунгма*.

САГДЗЕ́ЕЎ Раальд Зіннуравіч (н. 26.12.1932, Масква), расійскі фізік. Акад. Рас. АН (1968; чл.-кар. 1964). Замежны чл. Нац. АН ЗША (1987), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1990) і інш. Герой Сац. Працы (1986). Брат Рэнада *Сагдзеева*. Скончыў Маскоўскі ун-т (1955). З 1956 у Ін-це атамнай энергіі імя І.В.Курчатава, з 1961 у Ін-це ядз. фізікі Сібірскага аддз. АН СССР, з 1971 у Ін-це высокіх тэмператур АН СССР (у 1973—88 дырэктар). З 1989 у Ін-це касм. даследаванняў АН СССР. З 1989 праф. Мэрылендскага ун-та (ЗША). Навук. працы па фізіцы плазмы, праблеме кіравальнага тэрмаядз. сінтэзу, магн. гідрадынаміцы, касм. фізіцы, праблемах глабальнай бяспекі. Тэарэтычна прадказаў і растлумачыў найб. характэрныя з'явы фізікі касм. плазмы — утварэнне бессутыкняльных ударных хваль і радыяцыйных паясоў. Развіў тэорыю працэсаў цеплаправоднасці і дыфузіі ў такамаках (1967—68; разам з А.А.Галеевым). Ленінская прэмія 1984.

Тв.: Коллективные процессы и ударные волны в разреженной плазме. Новосибирск, 1963; Физика плазмы для физиков. М., 1979 (разам з Л.А.Арцымовічам); Введение в нелинейную физику: От маятника до турбулентности и хаоса. М., 1988 (разам з Г.М.Заслаўскім).

М.М.Касцюковіч.

САГДЗЕ́ЕЎ Рэнад Зіннуравіч (н. 13.12.1941, г. Казань, Расія), расійскі вучоны ў галіне хім. фізікі; адзін са стваральнікаў спінавай хіміі. Акад. Рас. АН (1997, чл.-кар. 1987). Брат Раальда *Сагдзеева*. Скончыў

Раальд З. Сагдзееў

Рэнад З. Сагдзееў.

Новасібірскі ун-т (1965). З 1983 нам. дырэктара Ін-та хім. кінетыкі і гарэння Сібірскага аддз. Рас. АН. З 1993 дырэктар Міжнар. тамаграфічнага цэнтра ў Новасібірску. Навук. працы па вывучэнні элементарных актаў хім. ператварэнняў, магнітных і спінавых эфектах у хім. рэакцыях, хім. палярызацыі ядзер, хім. радыёспектраскапіі. Ленінская прэмія 1986. Дзярж. прэмія Расійскай Федэрацыі 1994.

Тв.: Магнитные и спиновые эффекты в химических реакциях. Новосибирск, 1978 (разам з А.Л.Бучачэнкам, К.М.Саліхавым); Основы магнитного резонанса. Иркутск, 1995 (разам з У.К.Воранавым); Основы современного естествознания. 2 изд. М., 1999 (разам з У.К.Воранавым, М.В.Грэчневай).

М.М.Касцюковіч.

САГДЫ́ЙЦЫ, согды, старажытная ўсх.-іранская народнасць у Цэнтр. Азіі. З сярэдзіны 1-га тыс. да н.э. насяляла *Согд* (Сагдыяну). Продкі сучасных таджыкаў і узбекаў, да цяперашняга часу захавалася невял. народнасць на Памірах — ягнобцы, якая размаўляе на адной з сагдыйскіх моў.

САГІ́ЯН Амо (сапр. Грыгаран Амаяк Саакавіч; 14.4.1914, с. Лор, Арменія — 16.7.1993), армянскі паэт, перакладчык. Скончыў Бакінскі пед. ін-т (1940). У 1945—67 працаваў у перыяд. друку. Друкаваўся з 1930-х г. У зб-ках лірычных вершаў «Арменія ў песнях» (1962), «Перад захадам сонца» (1964), «Сезам, адчыніся» (1972), «Вячэрняя трапеза» (1977), «Зялёна-чырвоная восень» (1980), «Кліч роду» (1981), «Кветка мяты» (1986) і інш. тэмы прыроды, кахання, філас. асэнсавання ўнутр. свету чалавека. Перакладаў рус. і замежных паэтаў. На бел. мову асобныя яго вершы пераклаў К.Камейша. Дзярж. прэмія Арменіі 1976.

Тв.: Рус. пер. — Зеленый тополь Наири. М., 1969.

Літ.: Поэзия поможет человеку. Ереван, 1974.

С.Арзуманян.

САГЎН Яўген Іванавіч (н. 18.1.1947, Баку), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1994). Скончыў БДУ (1970). З 1970 у Ін-це фізікі, з 1994 у Ін-це малекулярнай і атамнай фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па спектраскапіі і фотахіміі біямалекул, вывучэнні фотафіз. і фотахім. працэсаў з удзелам малекулярнага кісларoду. Даследаваў міжхрамафорныя ўзаемадзеянні і структурную дынаміку парфірынаў і іх структурнаарганізаваных сістэм, прапанаваў фотасенсібілізатары на аснове хларынаў і парфірынаў.

Тв.: Тушение молекулярным кислородом возбужденных электронных состояний хлорофилла и родственных соединений и фотосенсибилизированное образование синглетного кислорода (разам з В.А.Ганжой, Б.М.Джагаравым) // Фотобиология и мембранная биофизика. Мн., 1999.

САД у садова-паркавым мастацтве, зямельны ўчастак, засаджаны дрэвамі, кустамі, кветкамі. Як і *парк*, з'яўляецца ч. *азелянення* і фарміруецца паводле асн. прынцыпаў *садова-паркавага мастацтва*. Ствараюцца для адпачынку, прагулак, гульняў. З калекцыйна-экспазіцыйнымі і навук. мэтамі ствараюцца С. спец. прызначэння (напр., *батанічны сад*). Гар. С. для кароткачасовага адпачынку наз. *скверам*. Ад парку культуры і адпачынку адрозніваецца меншымі памерамі, нязначнай колькасцю спарт. збудаванняў, атракцыёнаў і інш. У кампазіцыі С. важную ролю адыгрываюць алеі, дарожкі, пляцоўкі, газоны, кветнікі, фантаны, каскады, каналы, малыя формы архітэктуры, часта ў С. ўключаюць альпінарыі і ружоўнікі. Для фарміравання прадметна-прасторавага асяроддзя і яго ўзбагачэння С. гарманічна спалучаюць рэльеф, вадаёмы і інш. сродкі *ландшафтнай архітэктуры*.

Вядомы з даўніх часоў: у Стараж. Егіпце, Вавілоне (т. зв. вісячыя сады Семіраміды), Рыме (багатыя С. ў загарадных вілах) і інш. Высокія дэкар. якасці ўласцівы С. сярэдневякоўя (Японія, Кітай, Індыя, Персія і інш.), эпохі Адраджэння (С. вілаў Баболі, д'Эстэ ў Італіі). З 12 ст. вядомы С. ў княжацкіх сядзібах Кіева, Уладзіміра (Расія). Сярод узораў С. — *Летні сад* у Пецярбургу, Аляксандраўскі ў Маскве.

На Беларусі С. вядомы з 15 ст. Іх ствараліў манастырах, каля замкаў, у магнацкіх сядзібах і маёнтках; часам яны мелі утылітарнае прызначэнне, напр., аптэчныя С. (аптэчныя агароды) — папярэднікі бат. С. З 17 ст. ствараліт.зв. зімовыя С. (аранжарэі), якія часам уваходзілі ў арх. кампазіцыю палацаў, сядзібных дамоў (*Альбінскі палацава-паркавы ансамбль, Радзівілімонтаўскі палацава-паркавы комплекс, Ружанскі палацавы комплекс* і інш.). У 17 ст. вядомы т.зв. італьянскія С., дзе спалучаліся утылітарныя і дэкар. функцыі. З 2-й пал. 18 ст. пашыраны бат. С. з калекцыямі мясц. і іншаземнай флоры (*Гродзенскі батанічны сад*, С. у г. Горкі Магілёўскай вобл.). У канцы 18 — пач. 19 ст. гар. С. створаны ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Магілёве, Рагачове, Чэрыкаве, яны спалучалі планіроўку пейзажнага тыпу з элементамі рэгулярнага. У 19 ст. з развіццём прамысл. садоўніцтва на ўчастках паркаў эканам. тыпу (в. Бабоўня Капыльскага, г.п. Казлоўшчына Дзятлаўскага, в. Псуя Глыбоцкага р-наў) узніклі пладовыя С. З канца 1950-х г. адным з асн. элементаў сістэмы азелянення і ўзбагачэння эстэтыкі тэр. жылой забудовы стаў мікрараённы С. Інтэр'еры грамадскіх будынкаў часам афармляюць т.зв. зімовымі С. Для ўзбагачэння арх.-ландшафтнага вырашэння аб'ектаў робяць С. на дахах і тэрасах жылых дамоў. Навукова-доследная база для азелянення нас. месцаў — бат. С., адзін з кірункаў даследаванняў якіх — зялёнае буд-ва і ландшафтная архітэктура (*Цэнтральны батанічны сад Нацыянальнай АН Беларусі, Батанічны сад БДУ, Батанічны сад Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта* і інш.).

Літ.: Горбачев В.Н. Архитектурно-художественные компоненты озеленения городов. М., 1983; Хромов Ю.Б. Планировка

Бутхардскі батанічны **сад** каля г. Вікторыя (Канада).

Былы Аляксандраўскі **сад** (цяпер Цэнтральны сквер) у Мінску.

Сад Баболі ў г. Фларэнцыя (Італія).

Сад камянёў манастыра Роандзі ў Токіо.

и оборудование садов и парков. Л., 1974; Сычева А.В., Сосков И.Н. Актуальность организации садов на искусственных основаниях // Стр-во и архитектура Белоруссии. 1981. № 1. *В.Р.Анціпаў, А.В.Сычова.*

САДА́ВА (Sadová), горад у Чэхіі, у раёне якога 3.7.1866 у час *аўстра-прускай вайны 1866* прус. войскі пад фактычным камандаваннем нач. Генштаба ген. Г.*Мольтке* Старэйшага (221 тыс. чал., 924 гарматы) разграміла аўстра-саксонскую Паўн. армію Л.Бенедэка (215 тыс. чал., 770 гармат). Вырашальную ролю ў зыходзе бітвы адыгралі больш дасканалыя прус. ваен. тэхніка і ўзбраенне, а таксама перавага ў стратэгіі і тактыцы. У выніку паражэння Аўстрыя вымушана была заключыць *Пражскі мір 1866.*

САДА́ВІЧЫ, вёска ў Бучацінскім с/с Капыльскага р-на Мінскай вобл., на р. Волка. Цэнтр калгаса. За 32 км на Пд ад г. Капыль, 147 км ад Мінска, 23 км ад чыг. ст. Цімкавічы. 397 ж., 154 двары (2001). Пач. школа-садок, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

САДАВЯ́НУ (Sadoveanu) Міхаіл (5.11.1880, г. Пашкані, Румынія — 19.10.1961), румынскі пісьменнік, грамадскі дзеяч. Чл. Рум. акадэміі (з 1921). Скончыў Нацыянальны ліцэй у Ясах (1900). Друкаваўся з 1897. Аўтар сац. раманаў «Вуліца Лэпушняну. Хроніка 1917 г.» (1921), «Плыў млын па Сірэце» (1925), у якіх крытыка тагачаснага грамадства. Стваральнік рум. гіст. рамана, у т.л. «Жыццё Штэфана Вялікага» (1934), трылогіі «Браты Ждэр» (1935—42) пра барацьбу рум. народа за нац. незалежнасць. У аповесці «Мітра Какор» (1949, Залаты медаль міру 1950) і гіст. рамане «Нікаарэ Падкова» (1952) роздум пра гіст. шляхі сялянства. Аўтар шматлікіх зб-каў апавяданняў і публіцыстыкі. На бел. мову асобныя яго творы пераклаў Л.Салавей. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» 1960.

Тв.: Бел. пер. — Выбр. творы. Мн., 1954; Рус. пер. — Избр. произв. М., 1957; Избранное. М., 1980.

Літ.: Кожевников Ю.А. Михаил Садовяну. М., 1960; Ройзман П.И. Михаил Садовяну: Биобиблиогр. указ. М., 1962.

САДАМАЗАХІ́ЗМ, палавая ненармальнасць у выглядзе спалучэння праяў *садызму* і *мазахізму.*

САДА́Т, ас-Садат Мухамед Анвар (25.12.1918, в. Міт-Абу-эль-Ком, Егіпет — 6.10.1981), дзяржаўны дзеяч Егіпта. Скончыў ваен. каледж у Каіры (1938). Сумесна з Г.А.*Насэрам* стварыў тайную арг-цыю «Свабодныя афіцэры». За антыбрыт. дзейнасць у 1942 звольнены з арміі, у 1942—44 і 1946—49 у турме. У 1950 адноўлены на ваен. службе. Удзельнік дзярж. перавароту 1952. У 1953—56 чл. Рэв. савета Егіпта, у 1957—58 нам., у 1960—61 і 1964—68 старшыня Нац. сходу (парламента) Аб'яднанай Араб. Рэспублікі (ААР). У 1964—66 і 1969—70 віцэ-прэзідэнт ААР. З вер. 1970 прэзідэнт ААР (з 1973 Араб. Рэспубліка Егіпет). Пераарыентаваў краіну на супрацоўніцтва з ЗША, пачаў ажыццяўленне ліберальных рэформ у палітыцы і эканоміцы. У ліст. 1977 першы з араб. лідэраў наведаў Ізраіль. У 1978—79 падпісаў пагадненні з Ізраілем (гл. *Кэмп-Дэвідскія пагадненні 1978*). Забіты фанатыкамі-ісламістамі. Нобелеўская прэмія міру 1978 (разам з М.*Бегінам*).

М.**Садавяну**.

М. **Садковіч**.

САДБЕ́РЫ (Sudbury), горад на У Канады, у прав. Антарыо. Засн. ў 1883. Каля 300 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Трансп. вузел. Аэрапорт. Цэнтр буйнога медна-нікелевага радовішча Садберы (распрацоўваецца з 1889). Здабываюць таксама кобальт, плацыноіды, серабро, золата, селен і тэлур. У горадзе — з-ды каляровай металургіі і хім. прам-сці. Ун-т.

САДЖА́НЕЦ, маладая расліна, вырашчаная з *сеянцаў* або *чаранкоў* для пасадкі на пастаяннае месца. С. пладовых дрэў атрымліваюць у *пладовых гадавальніках* з прышчэпаў на працягу 1—2 гадоў. С. ягадных культур (агрэст, парэчкі) — аднагадовыя непрышчэпленыя расліны (укаранёныя чаранкі, адводкі). У якасці С. маліны выкарыстоўваюць каранёвыя атожылкі; С. суніцы — ліставыя разеткі на вусах. У лесаводстве С. — маладыя дрэўцы (часцей пародаў дрэў, якія марудна растуць у раннім узросце — елка, піхта), прызначаныя для закладкі лясных культур і ахоўных лясных насаджэнняў, вырошчваюць 2—8 гадоў у школьным аддзяленні *лясного гадавальніка.*

САДКО́ВІЧ Мікола (Мікалай Фёдаравіч; 21.1.1907, в. Вусце Аршанскага р-на Віцебскай вобл. — 16.8.1968), бел. і расійскі кінарэжысёр, кінадраматург, пісьменнік. Засл. дз. маст. Беларусі (1944). Скончыў Дзярж. тэхнікум кінематаграфіі ў Маскве (1928). Да 1945 рэжысёр і сцэнарыст на кінастудыях Масквы, Адэсы, Кіева, Ташкента. У 1946—47 і 1950—53 міністр кінематаграфіі Беларусі, у 1953—56 нам. міністра культуры Беларусі. Працаваў гал. рэдактарам і рэжысёрам Цэнтр. студыі дакумент. фільмаў (Масква). Рэжысёр маст. і дакумент. фільмаў «Шчаслівыя кольцы» (1929), «Песня пра першую дзяўчыну» (1930, абодва з Л.Голубам), «Шумі, гарадок» (1939), «Дэмакратычная Германія» (сумесна з «Дэфа», 1950; Дзярж. прэмія СССР 1951). Сцэнарыст і пастаноўшчык фільмаў «Майская ноч» (паводле М.Гогаля, 1940), «Беларускі кінаканцэрт» («Жыві, родная Беларусь!»), «Вызваленне Савецкай Беларусі» (абодва з У.Корш-Сабліным, 1944). Аўтар гіст. раманаў «Георгій Скарына» (з Я.Львовым, 1951),«Мадам Любоў» (1966), «Аповесці аб ясным Стахоры» (1956), аповесці «Чалавек у тумане» (1960), сцэнарыяў фільмаў «Міколка-паравоз» (з М.Лыньковым, 1957), «Наша зямля» (1960), «Ахвяры абвінавачваюць» (1962), «Я, Францыск Скарына» («Беларусьфільм», 1970).

Тв.: Избранное. Мн., 1979.

САДКО́ВЫЯ РЫ́БНЫЯ ГАСПАДА́РКІ. Гадуюць рыбу ў сеткавых або кацістых прыстасаваннях — садках. Выкарыстоўваюць прыродныя вадаёмы, вадасховішчы, сажалкі, вадаёмы-ахаладжальнікі і інш. Садкі (стацыянарныя або плывучыя) бываюць драўляныя, металічныя і інш.; памеры, форма, дэталі канструкцыі залежаць ад віду рыбы, асаблівасцей вадаёма і інш. С.р.г. забяспечваюць эканомію вады і зямельных угоддзяў, павялічваюць перыяд вырошчвання рыбы ва ўмовах аптымальнага тэмпературнага рэжыму. На Беларусі асн. аб'екты — карпавыя рыбы (карп, карась, расліннаедныя), шчупак, стронга. Агульная пл. садкоў каля 20 тыс. м^2, найб. буйная Белаазерская С.р.г. (Брэсцкая вобл.) на Бярозаўскай ДРЭС.

Садковая рыбная гаспадарка.

САДО́ВА-ПА́РКАВАЕ МАСТА́ЦТВА, мастацтва фарміравання *садоў, паркаў* і інш. азеляненых участкаў гарманічным спалучэннем прыродных і арх. элементаў (рэльеф, вадаёмы, дрэвы, кусты, кветкі, пляцоўкі, розныя збудаванні, скульптура). У працэсе яго развіцця пад уплывам прыродна-кліматычных умоў, быт. і культ. традыцый, эстэт. поглядаў выпрацаваны разнастайныя кампазіцыйныя прыёмы, якія ўмоўна зводзяцца да 2 асн. прынцыпаў — *рэгулярнага парку* (геам.) і *пейзажнага парку* (маляўнічага, імітуе прыродны ландшафт). Існуюць паркі і мяшанага тыпу.

Вядома са старажытнасці. Асн. прыёмы С.-п.м. склаліся ў 16—18 ст. у Зах. Еўропе. У эпоху Адраджэння ў Італіі паявіліся рэгулярныя сады, якія ўяўлялі сабой сістэму эфектных перспектыў і размяшчаліся на тэрасах з падпорнымі сценкамі, манум. лесвіцамі, скульптурай, каскадамі, фантанамі. Рацыяналістычныя прынцыпы, якія пераважалі ў мастацтве Францыі 17 ст., увасобіліся ў строга геам. планіроўцы рэгулярных («французскіх») паркаў. У сярэдзіне 18 ст. ў Еўропе ўзніклі свабодна распланаваныя пейзажныя паркі (Вялікабрытанія, Францыя). Першыя стараж.-рус. сады вядомы ў 12 ст. У 17 ст. ў Маскве дэкар. афармленнем вылучаліся т.зв. вярховыя («красныя») сады ў верхніх паверхах будынкаў (сады Крамлёўскага палаца); існавалі рэгулярныя сады ў загарадных сядзібах, для іх характэрна спалучэнне дэкар. якасцей з утылітарнымі (пладовыя насаджэнні). У 18 ст. створаны палацава-паркавыя ансамблі ў гарадах *Петрадварэц*, *Пушкін*, *Летні сад* у Пецярбургу (рэгулярныя паркі), пейзажныя паркі ў *Паўлаўску*, Кузьмінках (Масква), *Уманскі дэндрапарк «Сафіеўка»* (Украіна). С.-п.м. канца 19 — пач. 20 ст. характарызуецца эклектызмам (ствараліся садова-паркавыя кампазіцыі тыпу яп. садоў, іспана-маўрытанскага патыо, альпійскай горкі). У 20 ст. з'явіліся новыя віды садоў і паркаў (спарт. паркі, паркі-выстаўкі, нац., прыродныя, гіст., дзіцячыя паркі, «сады на дахах» і інш.). Для масавага адпачынку ствараюцца вял. гар. паркі. Выкарыстоўваюцца новыя кампазіцыйныя прыёмы, заснаваныя на функцыян. заніраванні тэр. паркаў, вылучэнні ў іх аб'ектаў відовішна-масавага, культ.-асв., спарт. і інш. прызначэння. С.-п.м. развіваецца і ў працэсе спецыялізацыі паркаў і садоў рознага функцыян. прызначэння — дзіцячых, спарт., выставачных, бат., заал., мемар. і інш. Пераважаюць свабодныя пейзажныя кампазіцыі, засн. на маст. інтэрпрэтацыі прыродных ландшафтаў, з уключэннем рэгулярна распланаваных частак.

Да арт. **Садова-паркавае мастацтва**. Кампазіцыя «Вялікі каскад» («Купанне Дыяны») у парку каралеўскага палаца ў г. Казерта (Італія).

На Беларусі лепшымі ўзорамі С.-п.м. з'яўляюцца *Бачэйкаўскі парк*, *Дубайскі парк*, паркі ў вёсках Вял. Мажэйкава Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл., Забалацце Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. і інш. (рэгулярныя), паркі *Гомельскага палацава-паркавага ансамбля*, *Жыліцкага палацава-паркавага ансамбля*, *Нясвіжскага палацава-паркавага комплексу*, *Столінскай сядзібы «Манькавічы»*, *Лагойскага палацава-паркавага ансамбля*, *Савейкаўскі парк* і інш. (пейзажныя). Характэрныя рысы С.-п.м. 2-й пал. 20 ст. — спалучэнне дакладнай планіровачнай схемы са свабоднай формай пасадак і кветкавага афармлення. З развіццём горадабудаўніцтва пашырыліся задачы па фарміраванні водна-зялёных сістэм, арх.-ландшафтнай арг-цыі адкрытых (незабудаваных) прастораў. Гэтыя задачы вырашаюцца галіной арх.-горадабуд. творчасці — *ландшафтнай архітэктурай*. У галіне С.-п.м. працуюць арх. Л.Белякова, Дз.Герашчанка, М.Жлоба, Л.Калініна, Г.Патаеў, І.Рудэнка, А.Сычова, І.Шпіт, В.Шыльнікоўская, Б.Юрцін і інш. Іл. гл. таксама да арт. *Сад*.

Літ.: Памятники природы Белоруссии. Мн., 1970; Антипов В.Г. Парки Белоруссии. Мн., 1975; Архитектурная композиция садов и парков. М., 1980; Кулагин А.Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии. Мн., 1981; Сычева А.В., Титова Н.П. Ландшафтный дизайн: Эстетика деталей городской среды. Мн., 1984; Горохов В.А., Лунц Л.Б. Парки мира. М., 1985; Боговая И.О., Фурсова Л.М. Ландшафтное искусство. М., 1988; Федорук А.Т. Садово-парковое искусство Белоруссии. Мн., 1989; Яго ж. Сады и парки. Мн., 2000.

Н.С.Будыка, А.В.Сычова.

САДО́ЎКА, вёска ў Альбрэхтаўскім с/с Расонскага р-на Віцебскай вобл., на аўтадарозе Расоны—Полацк. Цэнтр калгаса. За 1 км на Пд ад г.п. Расоны, 158 км ад Віцебска, 45 км ад чыг. ст. Дрэтунь. 489 ж., 187 двароў (2001). Раённыя электрасеткі, камбінат прамысл. тавараў. Свята-Узнясенская царква.

САДО́ЎНІЦКАЕ ТАВАРЫ́СТВА, арганізацыя, якая садзейнічае вырашэнню задач членаў калектыўнага садаводства. Ствараецца грамадзянамі на добраахвотных асновах. Фарміруецца, рэгіструецца і канцэлюецца раённымі (гарадскімі) выканаўчымі і распарадчымі органамі. Пасля рэгістрацыі С.т. з'яўляецца юрыд. асобай. Дзейнасць С.т., правы і абавязкі яе членаў рэгламентуюцца статутам т-ва. Аб'екты і збудаванні агульнага карыстання, пабудаваныя за кошт мэтавых і членскіх узносаў, з'яўляюцца агульнай маёмасцю т-ва. С.т. мае права займацца таксама прадпрымальніцкай дзейнасцю (прыбытак, атрыманы ў выніку гэтай дзейнасці, выкарыстоўваецца для набыцця маёмасці агульнага карыстання, на яе эксплуатацыю і рамонт).

На Беларусі членамі С.т. могуць быць грамадзяне, якія ў адпаведнасці з зямельным заканадаўствам маюць права на зямельныя ўчасткі для вядзення калектыўнага садаводства.

САДО́ЎНІЦТВА, галіна сельскай гаспадаркі, што ўключае *пладаводства*, *вінаградарства*, вырошчванне гародніных, лек., дэкар., трапічных і субтрапічных культур. Часта ўжываецца як сінонім пладаводства.

САДО́ЎСКАГА ЭФЕ́КТ, узнікненне вярчальнага мех. моманту ў целе, якое апрамяняецца эліптычна (ці цыркулярна) палярызаваным святлом. Абумоўлены наяўнасцю адметнага ад нуля моманту імпульсу ў фатонаў святла з такой палярызацыяй. Адкрыты А.І.*Садоўскім* (1898), выяўлены эксперыментальна амер. фізікам Р.Бетам (1935). Існаванне С.э. дазваляе выкарыстоўваць закон захавання моманту імпульсу пры даследаванні з'яў узаемадзеяння эл.-магн. выпрамянення з рэчывам.

Літ.: Розенберг Г.В. Наблюдение спинового момента сантиметровых волн // Успехи физ. наук. 1950. Т. 40, вып. 2; Бокуть Б.В., Митюрич Г.С., Шепелевич В.В. Эффект Садовского в поглощающих гиротропных средах. Мн., 1980.

А.І.Болсун.

САДО́ЎСКІ Аляксандр Іванавіч (6.12.1859, г. Віцебск — 26.12.1923), расійскі фізік і педагог. Праф. (1894). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1881). Працаваў у ВНУ Пецярбурга. З 1894 у Юр'еўскім (Тартускім) ун-це, з 1916 заг. кафедры фізікі Мікалаеўскай марской акадэміі (Пецярбург), адначасова з 1915 супрацоўнік вайскова-прамысл. камітэта. З 1919 у Празе. Навук. працы па оптыцы і электрамагнетызме. У кн. «Пандэраматорныя дзеянні электрамагнітных і светлавых хваль на крышталі» (1898) тэарэтычна даказаў вярчальнае дзеянне палярызаваных эл.-магн. хваль (гл. *Садоўскага эфект*). Адзін з арганізатараў і ўдзельнік першага ў Расіі з'езда выкладчыкаў фізікі (1902).

Літ.: Развитие физики в России. Т. 2. М., 1970; Процька Т. Даследчык таямніцаў святла: Аляксандр Садоўскі. Мн., 1994.

А.І.Болсун.

САДО́ЎСКІ Антон Паўлавіч (н. 7.2.1944, в. Красняны Мядзельскага р-на Мінскай вобл.), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1997). Скончыў БДУ (1966). У 1967—82 і з 1999 у БДУ. У 1982—99 у Гродзенскім ун-це (у 1982—84 заг. кафедры). Навук. працы па якаснай тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў. Распрацаваў метады рашэння класічнай праблемы цэнтра і фокуса для адвольных аналіт. сістэм дыферэнцыяльных ураўн. на плоскасці.

Тв.: Нелинейные колебания в системах второго порядка. Мн., 1982 (разам з

У.В.Амелькіным, М.А.Лукашэвічам); Проблема центра и фокуса для аналитических систем с нулевой линейной частью // Дифференциальные уравнения. 1989. Т. 25, № 5—6; Решение проблемы центра и фокуса для кубической системы нелинейных колебаний // Там жа. 1997. Т. 33, № 2.

В.Дз.**Садоўскі**.

М.К.**Садоўскі**.

М.А.**Садоўскі**.

САДО́ЎСКІ Вісарыён Дзмітрыевіч (6.8.1908, г. Омск, Расія — 1991), расійскі вучоны ў галіне металазнаўства. Акад. АН СССР (1970). Герой Сац. Працы (1978). Скончыў Казанскі ун-т (1930). З 1935 ва Уральскім навук. цэнтры АН СССР, з 1958 у Ін-це фізікі металаў АН СССР (г. Екацярынбург), адначасова ў 1944—59 выкладаў ва Уральскім політэхн. ін-це. Навук. працы па кінетыцы пераўтварэнняў пераахалоджанага аўстэніту, тэорыі фазавых і структурных пераўтварэнняў пры нагрэванні сталі, умацаванні і легіраванні сталей і сплаваў. Дзярж. прэмія СССР 1986.

Тв.: Фазовые и структурные превращения при нагреве стали. Свердловск; М., 1954 (разам з К.А.Малышавым, Б.Г.Сазонавым); Структурная наследственность в стали. М., 1973.

САДО́ЎСКІ (сапр. Табілевіч) Мікалай Карпавіч (18.3.1856, с. Каменна-Каставатае Брацкага р-на Мікалаеўскай вобл., Украіна — 7.2.1933), украінскі акцёр, рэжысёр. Брат І.*Карпенкі-Карага*, П.*Саксаганскага*. У 1881 пачаў дзейнасць у прафес. т-рах; працаваў у трупах М.Крапіўніцкага, М.Старыцкага і інш. У 1888 узначаліў (з М.Занькавецкай) сваю трупу (у 1898 аб'ядналася з трупай Саксаганскага, у 1900 — Крапіўніцкага), якая стала адным з лепшых укр. тэатр. калектываў. У 1906 арганізаваў першы ўкр. стацыянарны прафес. т-р (працаваў у Палтаве, пасля да 1920 у Кіеве). У 1921—23 узначальваў прафес. т-р у Ужгарадзе. Некат. час жыў у Чэхіі. З 1926 на радзіме, гастраліраваў у розных тэатр. калектывах. Самабытны акцёр, сцэн. творчасць якога засн. на глыбокім веданні жыцця, побыту і гісторыі народа. Сярод роляў: Багдан Хмяльніцкі, Тарас Бульба (аднайм. драмы Старыцкага), Гнат, Тарас, Апанас, Мартын Баруля, Сава («Абядзоленая», «Бандароўна», «Бурлака», «Мартын Баруля», «Сава Чалы» Карпенкі-Карага), Гараднічы («Рэвізор» М.Гогаля), Старшына («Па рэвізіі» Крапіўніцкага), Камандор («Каменны гаспадар» Л.Украінкі). Ставіў п'есы Б.Грынчанкі, Л.Яноўскай, Л.Украінкі, С.Васільчанкі, Гогаля, А.Астроўскага, Л.Талстога, оперы М.Лысенкі, Р.Казачэнкі, Дз.Січынскага, С.Манюшкі, Б.Сметаны і інш. Аўтар лібрэта да оперы Лысенкі «Энеіда» (паводле І.Катлярэўскага), мемуараў «Успаміны з руска-турэцкай вайны» (1917), «Мае тэатральныя ўспаміны» (1907—29).

Літ.: Василько В.С. Микола Садовський та його театр. Київ, 1962; Спогади про Миколу Садовського. Київ, 1981.

САДО́ЎСКІ Міхаіл Аляксандравіч (6.11.1904, С.-Пецярбург — 12.10.1994), расійскі геафізік; адзін з заснавальнікаў фізікі выбуху. Акад. Рас. АН (1966; чл.-кар. 1953). Герой Сац. Працы (1949). Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т (1928). З 1930 у Сейсмалагічным ін-це АН СССР, з 1941 у Прэзідыуме АН СССР, з 1948 нам. дырэктара Ін-та хім. фізікі АН СССР. З 1960 дырэктар, з 1989 ганаровы дырэктар Ін-та фізікі Зямлі Рас. АН. У 1967—69 акад.-сакратар Аддзялення навук аб Зямлі АН СССР. Навук. працы па гравіметрыі, фізіцы выбуху і ўдарных хваль, мех. і сейсмічным дзеянні выбуху, мадэліраванні геафіз. асяроддзя, геамеханіцы горных парод, сейсмічнай бяспецы і прагназаванні землетрасенняў. Распрацаваў метад вызначэння сейсмічна небяспечных аблегласцей пры ўзрыўных работах. Прапанаваў блочна-іерархічную мадэль структурнай будовы літасферы (1979). Залаты медаль імя Ламаносава АН СССР (1985). Ленінская прэмія 1962. Дзярж. прэміі СССР 1948, 1949, 1951, 1953.

Тв.: Избр. труды. Геофизика и физика взрыва. М., 1999.

Літ.: М.А.Садовский. М., 1994.

М.М.Касцюковіч.

САДО́ЎСКІ Яфім Ільіч (4.1.1908, Мінск — 13.9.1993), бел. пісьменнік, журналіст. Скончыў агульнаадукацыйныя курсы (1927). Працаваў у рэдакцыях газет у Мінску. Друкаваўся з 1923. Пісаў пераважна на рус. мове. Аўтар зб-каў вершаў «Паўстанак» (1927, з Р.Ладным), «Каралі» (1991), апавяданняў «Скрыпка і ордэн» (1935), «Я бачу» (1939), «Ясныя далі» (1951), «Жыцці і лёсы» (1962), нарысаў, брашур. Склаў зб-кі «Маякоўскі ў Беларусі» (1957), «Жыццё, аддадзенае барацьбе» (пра В.Харужую, 2-е выд. 1983), «Успаміны пра Змітрака Бядулю» (1988, з К.Цвіркам). Аўтар сцэнарыяў дакумент. фільмаў «Наваселле» (1945) і «Па малых рэках» (1947).

Тв.: Отвергнутая любовь: Рассказы. Мн., 1991.

САДО́ЎСКІЯ, сям'я рускіх акцёраў.

Проў Міхайлавіч (сапр. Ярмілаў; 23.10.1818, г. Ліўны Арлоўскай вобл., Расія — 28.7.1872). З 1832 у правінцыяльных т-рах, з 1839 у Малым т-ры. Удзельнічаў у першых пастаноўках амаль усіх п'ес А.Астроўскага, садзейнічаў іх сцвярджанню на сцэне: Дзікой («Навальніца»), Кураслепаў («Гарачае сэрца»), Красноў («Грэх ды бяда на каго не жыве»), Любім Тарцоў («Беднасць не загана»). Сярод інш. роляў: Падкалёсін, Восіп («Жаніцьба», «Рэвізор» М.Гогаля), Расплюеў («Вяселле Крачынскага» А.Сухаво-Кабыліна), Ананій, Мітрыч («Горкі лёс», «Самаўпраўцы» А.Пісемскага). Яго творчай манеры ўласцівы акцэнт на сац.-побытавай абмалёўцы характараў, раскрыццё яго нац. спецыфікі. Аўтар гумарыстычных апавяданняў. Міхаіл Провавіч (24.11.1847, Масква — 8.8.1910), сын Прова Міхайлавіча. З 1869 у Малым т-ры. Першы выканаўца шэрагу роляў у п'есах Астроўскага. Сярод інш. значных роляў: Хлестакоў («Рэвізор» Гогаля), Пётр («Улада цемры» Л.Талстога), Калгуеў («Новая справа» У.Неміровіча-Данчанкі). Яго творчасць адметная спалучэннем глыбокай жыццёвай праўдзівасці, светлага гумару, задушэўнасці з драматызмам і сатырычнай вастрынёй. Аўтар нарысаў і апавяданняў з жыцця купецкай і мяшчанскай глушы (т. 1—2, 1899). Яго пераклады п'ес (Ж.Расіна, П.Бамаршэ, К.Гальдоні, К.Гоцы і інш.) ставіліся ў Малым т-ры. Выкладаў у Муз.-драм. вучылішчы Маскоўскага філарманічнага т-ва, на драм. курсах Маскоўскага тэатр. вучылішча. Вольга Восіпаўна (дзявочае Лазарава; 25.6.1849, Масква — 8.12.1919), жонка Міхаіла Провавіча. З 1879 у Малым т-ры. Яе ігра адметная выразнасцю сцэн. маўлення, яркасцю, тонкім гумарам. Сярод роляў у п'есах Астроўскага: Домна Панцялеўна («Таленты і паклоннікі»), Галчыха («Без віны вінаватыя»), Глафіра Фірсаўна («Апошняя ахвяра»), Маўра Тарасаўна («Праўда добра, а шчасце лепш»). З інш. роляў: Матрона («Улада цемры» Талстога), графіня Хруміна («Гора ад розуму» А.Грыбаедава). Лізавета Міхайлаўна (5.5.1872—4.6.1934), дачка Міхаіла Провавіча і Вольгі Восіпаўны, па сцэне (пры жыцці маці) Садоўская 2-я. З 1894 у Малым т-ры. Выконвала лірыка-драм. і камед. ролі: Глафіра, Снягурачка, Паліксена, Негіна, Юлінька, Верачка, Варвара («Ваўкі і авечкі», «Снягурачка», «Праўда добра, а шчасце лепш», «Таленты і паклоннікі», «Даходнае месца», «Жартаўнікі», «Навальніца» Астроўскага), Мар'я Антонаўна («Рэвізор» Гогаля), Сюзана («Жаніцьба Фігаро» Бамаршэ). Проў Міхайлавіч (21.8.1874, Масква — 4.5.1947), сын Міхаіла Провавіча і Вольгі Восіпаўны. Нар. арт. СССР

(1937). З 1895 у Малым т-ры. Найб. значныя ролі: Нешчасліўцаў («Лес» Астроўскага), Фамусаў («Гора ад розуму» Грыбаедава), Кошкін, Расцёгін («Любоў Яравая», «На беразе Нявы» К.Транёва), Таланаў («Нашэсце» Л.Лявонава). Выступаў і як рэжысёр. Паставіў п'есы «Снягурачка» (1922) і «Ваўкі і авечкі» (1944) Астроўскага, «Гора ад розуму» Грыбаедава (1938) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1943. У т-ры працавалі і інш. прадстаўнікі сям'і С.

Літ.: Семья Садовских. М.; Л., 1939; Дурылин С.Н. П.М.Садовский. М., 1950; Клинчин А.П., Клинчин П.М. П.М.Садовский. М., 1968.

САДО́Ф'ЕЎ Ілья Іванавіч (24.7.1889, С.-Пецярбург — 17.7.1965), рускі паэт, перакладчык. Друкаваўся з 1912. Першы паэт. зб. — «Дынама-вершы» (1918). Аўтар зб-каў вершаў «Прасцей простага» (1925), «Крутое жыццё» (1929), паэмы «Індустрыяльная жалейка» (1923), кн. апавяд. «Акрываўленая лесвіца» (1920) і інш. На рус. мову пераклаў вершы Я.Купалы, Я.Коласа, П.Глебкі, М.Машары, П.Панчанкі, П.Пестрака, М.Танка. Перакладаў з укр. і літ. моў. Яго вершы на бел. мову перакладалі А.Бялевіч, А.Гурло, І.Калеснік, А.Якімовіч.

Тв.: Избранное. М.; Л., 1960; Песня о Родине. Л., 1953; Индустриальная свирель. Л., 1971.

А.С.Малінін.

САДРУ́ЖНАСЦІ МО́РА. У Індыйскім ак. каля берагоў Усх. Антарктыды, паміж Зямлёй Эндэрбі і Зах. шэльфавым ледавіком. Пл. каля 260 тыс. км^2. Глыб. да 500 м на Пд і больш за 3000 м на Пн. Б.ч. года ўкрыта дрэйфуючымі льдамі. Шмат айсбергаў. На беразе С.м. — аўстрал. навук. станцыі Моўсан і Дэйвіс. Названа ў 1962 удзельнікамі сав. антарктычнай экспедыцыі у азнаменаванне сумесных доследных работ экспедыцый розных дзяржаў у Антарктыцы.

САДРУ́ЖНАСЦЬ, Садружнасць нацый (англ. Commonwealth, Commonwealth of Nations; да 1947 Брытанская садружнасць нацый), аб'яднанне ў складзе Вялікабрытаніі і яе былых калоній і дамініёнаў. Юрыдычна аформлена *Вестмінстэрскім статутам 1931* (удакладнены ў 1947). Першапачаткова ўключала Вялікабрытанію, Канаду, Аўстрал. Саюз, Новую Зеландыю, Паўд.-Афр. Саюз, Ньюфаўндленд і Ірландыю; уяўляла сабой асабістую унію, кіраўніком кожнай дзяржавы лічыўся брыт. манарх, якога прадстаўляў прызначаны ім ген.-губернатар. Пасля 2-й сусв. вайны з уступленнем у С. былых калоній-рэспублік (першая Індыя з 1949) манархічны характар аб'яднання страчаны. У 2000 аб'ядноўвала 53 краіны з рознымі формамі праўлення. Існуюць Сакратырыят С., праводзяцца штогадовыя канферэнцыі краін С. на ўзроўні прэм'ер-міністраў і міністраў фінансаў. У Вялікабрытаніі ёсць мін-ва па справах С. Гал. мэты С. — развіццё эканам., культ., навук., адукацыйных і інш. сувязей на базе традыцый агульнай мінулай гісторыі. Аднак на міжнар. арэне С. не выступае як адзінае цэлае. Кожная краіна мае права аднабаковага выхаду з С. [напр., у 1948 выйшла Бірма (М'янма), у 1949 — Ірландыя]. З 1995 у С. уваходзіць Мазамбік, які не быў брыт. калоніяй. Асобая роля Вялікабрытаніі вызначаецца не юрыд. нормамі, а эканам., фін. і паліт. адносінамі паміж Вялікабрытаніяй і інш. краінамі С.

Ю.В.Бажэнаў.

САДРУ́ЖНАСЦЬ НЕЗАЛЕ́ЖНЫХ ДЗЯРЖАЎ (СНД), аб'яднанне суверэнных дзяржаў, утворанае на большай частцы тэрыторыі *Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік* у выніку *Белавежскіх пагадненняў 1991* паміж Рэспублікай Беларусь, Рас. Федэрацыяй і Украінай. Кіраўнікі 11 суверэнных дзяржаў (б. рэспублік СССР, акрамя прыбалтыйскіх і Грузіі) падпісалі 21.12.1991 у г. Алматы (да 1995 сталіца Казахстана) Пратакол да Пагаднення аб стварэнні Садружнасці, у якім падкрэслівалася, што Азербайджан, Арменія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Малдова, Расія, Таджыкістан, Туркменістан, Узбекістан і Украіна на раўнапраўных пачатках утвараюць СНД, і Дэкларацыю, якая пацвердзіла прыхільнасць гэтых дзяржаў да супрацоўніцтва ў розных сферах знешняй і ўнутр. палітыкі, абвясціла гарантыі выканання міжнар. абавязацельстваў б. СССР. Парламенты краін — членаў СНД ратыфікавалі Белавежскія пагадненні. У снеж. 1993 да Садружнасці далучылася Грузія. СНД дзейнічае на аснове Статута, прынятага Саветам кіраўнікоў дзяржаў 22.1.1993. Садружнасць засн. на пачатках суверэннай роўнасці ўсіх яе членаў. Дзяржавы — члены СНД з'яўляюцца самастойнымі і раўнапраўнымі суб'ектамі міжнар. права. СНД не з'яўляецца дзяржавай і не валодае наднац. паўнамоцтвамі. У вер. 1993 кіраўнікі дзяржаў СНД падпісалі Дагавор аб стварэнні Эканам. саюза, у якім закладзена канцэпцыя трансфармацыі гасп. ўзаемадзеянняў у рамках Садружнасці. Узаемадзеянне краін ў рамках СНД ажыццяўляецца праз яго каардынуючыя ін-ты: Савет кіраўнікоў дзяржаў (чарговае пасяджэнне адбылося ў Мінску 1.6.2001), Савет кіраўнікоў урадаў, *Міжпарламенцкую Асамблею СНД*, Выканаўчы камітэт (дзейнічае з 2.4.1999 як пераемнік Выканаўчага сакратарыята і Міждзярж. эканам. к-та, размешчаных у Расіі і Беларусі) і інш. Статус назіральніка прадастаўлены Садружнасці Ген. Асамблеяй ААН (сак. 1994) і Саветам па гандлі і развіцці (ЮНКТАД; 19.4.1994). Паміж сакратарыятам ЮНКТАД і Выканаўчым к-там СНД падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве (5.5.1994). У 1995 наладжаны дзелавыя кантакты з Міжнар. арг-цыяй працы, Сусв. арг-цыяй аховы здароўя, Упраўленнем Вярх. камісара ААН па справах бежанцаў. Прадстаўнікі Выканаўчага к-та ўдзельнічаюць у буйнейшых нарадах і форумах, якія праводзяцца па лініі ААН, *Еўрапейскага саюза, Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе*, інш. міжнар. арг-цый. Некат. краіны Садружнасці стварылі асобныя аб'яднанні: Саюз Беларусі і Расіі, Мытны саюз (Рэспубліка Беларусь, Рас. Федэрацыя, Казахстан, Кыргызстан і Таджыкістан) і інш.

Узаконена канцэпцыя рознахуткаснай інтэграцыі ўнутры Садружнасці. З сярэдзіны 1990-х г. у СНД выявіліся і цэнтрабежныя тэндэнцыі, надзеі на хуткую і цесную інтэграцыю яе краін-членаў не апраўдаліся. Асн. прычыны такога працэсу: розныя падыходы дзяржаў СНД да праблем рэфармавання органаў Садружнасці, вызначэння іх структуры і функцый, рознагалоссі ў выпрацоўцы агульнай эканам. канцэпцыі на макра- і мікраўзроўні і агульнай палітыкі ў забеспячэнні калект. бяспекі; боязь страціць значную частку суверэнітэту і магчымасці прысвоення гэтых функцый Расіяй; неэфектыўнасць дагавораў і пагадненняў у рамках СНД; розніца сфер інтарэсаў і мэт знешняй палітыкі краін — удзельніц СНД. Не выконваюцца многія палажэнні Дагавора аб калект. бяспецы (1992), з якога выйшлі Азербайджан, Грузія і Узбекістан (1999). Рэспубліка Беларусь выступае за захаванне СНД, больш цесныя эканам., паліт. і ваен. супрацоўніцтва і інтэграцыю; была адным з ініцыятараў падпісання дагавораў і пагадненняў аб Мытным саюзе, адзінай эканам. прасторы, калект. бяспецы, фарміраванні зоны свабоднага гандлю.

Літ.: Содружество независимых государств: Портрет на фоне перемен. Мн., 1996; Гордейчик А., Снапковский В. О нынешнем состоянии СНГ и перспективах его развития // Бел. журн. междунар. права и междунар. отношений. 1999. № 1.

А.В.Шарапа.

САДРУ́ЖНАСЦЬ ПО́ЛЬСКАГА НАРО́ДА (Stowarzyszenie Ludu Polskiego), польская тайная вызваленчая арг-цыя ў *Кракаўскай рэспубліцы*, *Галіцыі*, Познаншчыне, *Каралеўстве Польскім*, Літве і Беларусі ў 1835—37. Гл. *Саюз польскага народа*.

САДЫ́ЗМ, алгалагнія, палавая ненармальнасць, пры якой палавое задавальненне дасягаецца ў працэсе прымянення партнёру фіз. або псіхічных пакут. Назва ад імя франц. пісьменніка маркіза дэ Сада, — аўтара раманаў на тэму сексуальных адхіленняў. У пераносным сэнсе С. — бязлітаснасць, жорсткасць, асалода ад чужых пакут.

САДЫ́ХАЎ Рауф Хасровавіч (н. 21.10.1944, Баку), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі. Д-р тэхн. н., праф. (1992). Скончыў Азербайджанскі політэхн. ін-т (1967). З 1971 у Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН Беларусі (з 1994 заг. лабараторыі). Адначасова з 1995 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі (заг. кафедры). Навук. працы па лічбавай апрацоўцы сігналаў і відарысаў, распазнаванні вобразаў і ідэнтыфікацыі сістэм.

Тв.: Методы и средства обработки сигналов в дискретных базисах. Мн., 1987 (разам з П.М.Чаголіным, У.П.Шмеркам); Метод генерирования стационарных случайных процессов на основе обобщенного ортогонального преобразования // Весці АН Беларусі. Сер. фіз.-тэхн. навук. 1995. №4.

САЕ́ВІЧ Канстанцін Фёдаравіч (н. 12.7.1956, в. Ясень Пружанскага р-на

Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне лесазнаўства і аховы прыроды. Д-р біял. н. (1992), праф. (1998). Скончыў Бел. тэхнал. ін-т (1978). З 1994 у Бел. агр. тэхн. ун-це (з 1997 дэкан). Навук. працы па тэарэт. канцэпцыі трафічных біягеацэнатычных гарызонтаў, кармавой ёмістасці ўгоддзяў, уліку ніжніх ярусаў расліннасці і карысных дзікарослых раслін, нарыхтоўцы лек. раслін, арганізацыі вучэбных лясніцтваў і паляўнічых гаспадарак.

Тв.: Охрана возобновимых ресурсов. Мн., 1992; Мониторинг лесных экосистем. Мн., 1992; Аналіз экакліматычных паказчыкаў у лесе і на адкрытым месцы. Мн., 1996.

САЕ́ВІЧ Платон Васілевіч (30.11.1892, б. вёска Раматова Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл. — 28.9.1956), дзяржаўны дзеяч Беларусі. Скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю (1911), Камуніст. ун-т імя Свярдлова (1924). З 1913 у арміі. Удзельнік устанаўлення сав. улады ў Віцебскай губ. З сак. 1919 у Чырв. Арміі. З 1924 на парт. рабоце ў Ніжагародскай губ. З 1926 дэкан і рэктар Бел. с.-г. акадэміі, з 1929 рэктар Камуніст. ун-та Беларусі, з 1932 дырэктар Ін-та гісторыі партыі і Кастр. рэвалюцыі пры ЦК КП(б)Б, з 1933 заг. кафедры Вышэйшай камуніст. с.-г. школы Беларусі, з 1939 выкладчык парт. курсаў пры ЦК КП(б)Б. Удзельнік Вял. Айч. вайны: камісар палка, нам. нач. паліт-упраўлення, нач. аддзела фронту; паліт. саветнік дэлегацыі ў сав.-амер. камісіі па Карэі. У 1947—51 міністр асветы БССР. Чл. ЦК КП(б)Б у 1932—34, 1949—52. Чл. ЦВК БССР у 1923—31. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1946—50. У маі 1951 беспадстаўна арыштаваны. 28.11.1951 Ваен. трыбуналам БВА прыгавораны да 25 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны ў 1954.

П.Дз.Лапец.

САЕ́ВІЧ Цімафей Аляксандравіч (н. 23.2.1919, в. Сухаполь Архангельскага р-на, Башкортастан), Герой Сав. Саюза (1945). Беларус. Скончыў Энгельскую ваен. авіяшколу пілотаў (1942). У Вял. Айч. вайну на фронце з 1943. Камандзір авіязвяна капітан С. зрабіў 160 вылетаў на разведку варожай дыслакацыі, удзельнічаў у 7 паветр. баях, разведаў і сфатаграфаваў 160 буйных нас. пунктаў, 80 чыг. вузлоў і станцый, 45 аэрадромаў і пасадачных пляцовак, абарону ворага пад Смаленскам, Віцебскам, Полацкам, у Прыбалтыцы. Да 1964 у Сав. Арміі, да 1984 у грамадз. авіяцыі.

Ц.А.Саевіч.

САЖА, тэхнічны вуглярод, высокадысперсны прадукт няпоўнага згарання або тэрмічнага раскладання вуглевадародаў прыроднага і прамысл. газаў, а таксама нафтавага і кам.-вуг. масел.

Парашок чорнага колеру з сяроднім дыяметрам часцінак 10—50 нм, шчыльн. 1760—1950 кг/м^3. Асн. кампанент — *вуглярод* (не менш за 90%). Атрымліваюць спальваннем прыроднага газу або яго сумесей з *нафтавым маслам* у спец. печах (пячныя С.) і камерах (канальныя, ці дыфузійныя С.), тэрмічным раскладаннем прыроднага газу ў генератарах без доступу паветра (тэрмічная С.). Выкарыстоўваюць як напаўняльнік гумы (больш за 80% вырабляемай С.) і пластмас, пігмент для друкарскіх фарбаў, капіравальнай паперы і інш., у вытв-сці некаторых сплаваў, спец. гатункаў паперы, гальванічных элементаў і інш.

Літ.: Зуев В.П., Михайлов В.В. Производство сажи. 3 изд. М., 1970; Сюняев З.И. Нефтяной углерод. М., 1980.

САЖА́ЛКА, штучны вадаём невялікіх памераў (звычайна плошча да 1 км^2). Ствараюцца шляхам перагароджвання плацінамі малых рэк, ручаёў, часовых вадацёкаў, а таксама абвалаваннем тэрыторыі па-за межамі рэчышча — у катлавінах, лагчынах і інш. паніжэннях рэльефу, у штучных выемках. Акумулююць мясц. сцёк. Прызначаны для арашэння, увільгатнення с.-г. угоддзяў, гасп.-быт., проціпажарных і рэкрэацыйных мэт, рыбагадоўлі (гл. *Сажалкавыя рыбныя гаспадаркі*). На Беларусі каля 1200 С. Сканцэнтраваны пераважна ў цэнтр. ч., дзе менш натуральных вадаёмаў. Падзяляюцца на рачныя (рэчышчавыя), ярыста-лагчынныя, кар'ерныя, наліўныя. Найб. пашыраны рачныя С., большасць іх у вярхоўях вадацёкаў. У адрозненне ад *вадасховішчаў* маюць адносна ўстойлівы ўзроўневы рэжым.

САЖА́ЛКАВЫЯ РЫ́БНЫЯ ГАСПАДА́РКІ. Гадуюць рыбу ў *сажалках* або прыстасаваных натуральных вадаёмах. Сажалкі абсталяваны прыстасаваннямі для запаўнення вадой з рэк і азёр, падтрымання яе ўзроўню ў час вегетац. сезону і спуску для адлову рыбы. Поўнасістэмныя С.р.г. маюць нераставыя (прызначаны для нарасту рыбы і развіцця малявак да 2—3 тыднёвага ўзросту), выраставыя (для гадоўлі сяголетак), нагульныя (для вырошчвання таварнай рыбы), зімавальныя (зімоўка рыбы), матачныя (утрыманне вытворнікаў), каранцінныя (для ізаляцыі хворай рыбы) сажалкі; маюць цэхі інкубацыйныя, кармавыя і па перапрацоўцы таварнай рыбы. Экстэнсіўныя С.р.г. гадуюць рыбу на натуральнай харч. базе. Больш эфектыўныя інтэнсіўныя С.р.г., у якіх выхад прадукцыі павялічваецца шляхам меліярацыі, угнаення вадаёмаў, штучным кармленнем рыбы. На Беларусі 18 С.р.г. сумарнай пл. нагульных сажалак 21,86 тыс. га, найб. буйныя — «Чырвоная Слабада» (2450 га) Салігорскага, «Лактышы» (2253 га) Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл., «Сялец» (2246 га) Бярэзінскага, «Любань» (2238 га) Любанскага р-наў Мінскай вобл. Гл. таксама *Рыбаводства*, *Рыбныя гаспадаркі*.

Да арт. **Сажалкавыя рыбныя гаспадаркі**: панарама сажалак (злева); схема размяшчэння вадаёмаў (а — выраставыя, б — нераставыя, в — зімавальныя сажалкі).

СА́ЖАНЬ, старажытная мера (адзінка) даўжыні. Назва ад стараж.-слав. «сягаці» — выцягваць, распасціраць рукі. С. карысталіся на Беларусі і ў Расіі з 11 ст. да ўвядзення метрычнай сістэмы мер (1918). Адрознівалі прамы С. — адлегласць паміж канцамі пальцаў выцягнутых (распасцёртых) рук (раўняўся 1,52 і 1,76 м) і касы — адлегласць паміж пальцамі нагі і рукі, выцягнутых па дыяганалі (2,16 і 2,48м). У 18 — пач. 20 ст. 1 С. = 3 аршынам = 48 вяршкам = =2,1336 м (гл. таксама *Аршын, Вяршок*).

СА́ЖЫН Мікалай Пятровіч (14.3.1897, г. Екацярынбург, Расія — 23.2.1969), расійскі вучоны ў галіне металургіі. Акад. АН СССР (1964, чл.-кар. 1953). Герой Сац. Працы (1967). Скончыў Маскоўскі хіміка-тэхнал. ін-т (1931), дзе выкладаў (з 1949 праф.). З 1964 старшыня секцыі Савета па фізіцы і хіміі паўправаднікоў АН СССР. Навук. працы па тэхналогіі рэдкіх металаў, паўправадніковых матэрыялаў і чыстых рэчываў. Ленінская прэмія 1961. Дзярж. прэмія СССР 1946, 1952.

Тв.: Развитие в СССР металлургии редких металлов и полупроводниковых материалов. М., 1967; Вещества высокой чистоты в науке и технике. М., 1969.

САЗА́Н (Cyprinus carpio), рыба сям. карпавых. 4 падвіды: амурскі, або амурска-кітайскі (C.c. haematopterus), аральскі (C.c. aralensis), в'етнамскі (C.c. viridiviolaceus) і еўрапейскі (C.c. carpio). Пашыраны ў вадаёмах бас. Міжземнага, Чорнага, Азоўскага, Каспійскага і Аральскага м., у воз. Ісык-Куль, у бас. рэк зах. ўзбярэжжа Ціхага акіяна. У нізоўях рэк, што ўпадаюць у паўд. моры, утварае паўпрахадныя формы. На Беларусі трапляўся ў бас. р. Дняпро. У інш. вадаёмах акультураная форма — *карп*.

Даўж. да 60 (зрэдку да 100) см, маса да 4,5 (адзінкавыя экз. да 45) кг. У спінным і анальным плаўніках мае па вызубленым касцявым промні. Рот канцавы. На верхняй губе і ў кутках рота па пары вусікаў. Корміцца беспазваночнымі жывёламі і раслінамі. Аб'ект промыслу і развядзення.

Літ.: Никольский Г.В. Частная ихтиология. 3 изд. М., 1971; Жизнь животных Т. 4. 2 изд. М., 1983; Рыбы: Попул. энцикл. справ. Мн., 1989. *А.М.Петрыкаў.*

1

2

Сазаны: 1 — еўрапейскі; 2 — амурскі.

М.П.Сажын.

Э.У.Сазерленд.

М.А.Сазонаў.

САЗАНДАРА́Н Татэвік Тыгранаўна (н. 2.9.1916, с. Хндзорэск Гарыскага р-на, Арменія), армянская спявачка (мецца-сапрана). Нар. арт. СССР (1956). Скончыла вак.-драм. студыю пры Доме культуры Арм. ССР у Маскве (1937). Да 1971 салістка Арм. т-ра оперы і балета. З 1961 выкладала ў кансерваторыі (з 1970 праф.) і адначасова з 1972 у Маст.-тэатр. ін-це ў Ерэване. У яе выкананні арганічна спалучаліся класічная і нац. манера выканання. Першая выканаўца партый у класічных і сучасных операх, у т.л. Алмаст («Алмаст» А.Спендыярава), Назелі («Гераіня» А.Сцепаняна). Дзярж. прэмія СССР 1951.

СА́ЗЕРЛЕНД (Sutherland) Эрл Уілбур (19.11.1915, г. Берлінгейм, штат Канзас, ЗША — 3.9.1974), амерыканскі біяхімік і фармаколаг. Чл. Нац. АН ЗША. Скончыў мед. школу Вашынгтонскага ун-та ў г. Сент-Луіс (1942) і працаваў у ім. З 1953 у Зах. ун-це ў г. Кліўленд, у 1963—73 ва ун-це Вандэрбільда ў г. Нашвіл. Навук. працы па вугляводным абмене, механізмах уздзеяння гарманальных і лек. рэчываў на арганізм. Адкрыў у жывёльных тканках цыклічную адэназінманафосфарную к-ту і даследаваў яе ролю ў механізме дзеяння гармонаў, рэгуляванні актыўнасці нерв. клетак, экспрэсіі генаў у бактэрый. Нобелеўская прэмія 1971.

САЗЛУ́ЧАНЫЯ САСУ́ДЫ, спалучальныя сасуды, сасуды, якія ў ніжняй частцы злучаны паміж сабой. У С.с. аднародная вадкасць устанаўліваецца на аднолькавым узроўні незалежна ад формы сасудаў. На гэтым заснавана дзеянне вадкаснага манометра, вадамернага шкла паравых катлоў і інш. Калі ў С.с. наліты вадкасці розных шчыльнасцей (ρ_1 і ρ_2), то яны ўстанаўліваюцца на розных узроўнях у адпаведнасці з суадносінамі $\rho_1 h_1 = \rho_2 h_2$.

САЗО́НАЎ Мікалай Аляксеевіч (8.4.1903, г. Цвер, Расія — 31.1.1963), бел. вучоны ў галіне электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Акад. АН Беларусі (1961), Акадэміі с.-г. навук Беларусі (1959—61), д-р тэхн. н. (1948), праф. (1951). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1929). У 1948—52 кіраўнік работ па выяўленні мясц. энергет. рэсурсаў Беларусі для электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. З 1959 акадэмік-сакратар Аддзялення механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі Акадэміі с.-г. навук Беларусі, з 1962 кіраўнік аддзела Цэнтр. НДІ механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі Нечарназёмнай зоны СССР (Мінск). Навук. працы па выкарыстанні электраэнергіі ў с.-г. вытв-сці, павышэнні каэф. магутнасці ў эл. установах. Прапанаваў метады разліку асінхронных электрарухавікоў.

Тв.: Справочник по применению электроэнергии в сельском хозяйстве. М., 1958 (у саўт.); Руководство для сельского электромонтера. 5 изд. М., 1960.

САЗО́НАЎ Міхаіл Іванавіч (н. 7.10.1938, г. Канск Краснаярскага краю, Расія), бел. вучоны ў галіне фізікі і тэхнікі плазмы. Д-р тэхн. н. (1991). Скончыў Маскоўскі ун-т (1961). З 1976 у Брэсцкім тэхн. ун-це. Навук. працы па даследаванні нізкатэмпературнай плазмы, доўгіх эл. і турбулентных дуг, прыэлектродных працэсаў. Распрацаваў прамысл. плазматроны з высокім цеплавым і эл. ккдз.

Тв.: Влияние газовой завесы на теплообмен между турбулентной дугой и стенкой разрядной камеры (у саўт.) // Изв. Сиб. отд. АН СССР. Сер. техн. наук. 1975. №8, вып. 2; Применение плазмотрона с межэлектродной вставкой для осаждения углеродных пленок (у саўт.) // Физика плазмы и плазменные технологии. Мн., 1997. Т. 4.



Да арт. **Сазлучаныя сасуды**: ρ_1, ρ_2 — шчыльнасці вадкасцей; h_1, h_2 — вышыні ўзроўняў вадкасцей.

САІ́Д АХМА́Д (сапр. Саід Ахмад Хусанхаджаеў; н. 10.6.1920, Ташкент), узбекскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Узбекістана (1980). Вучыўся ў Ташкенцкім ун-це (1940—41). Першы

зб. апавяданняў «Падарунак» (1940). У творах «Ферганскія апавяданні» (1948), аповесці «Прыгавор» (1958) паказвае духоўнае аблічча рабочых і інтэлігенцыі, працу і гераізм народа. Раман «Гарызонт» (кн. 1—3, 1964—74) пра падзеі Вял. Айч. вайны. Аўтар зб-каў апавяданняў «Стэпавы беркут» (1960), «Мілыя маці» (1962), «Каштоўны камень Бадахшана» (1966), п'есы «Бунт нявестак» (1976) і інш. На бел. мову некат. творы С.А. пераклаў І.Сакалоўскі.

Тв.: Рус. пер. — Журавли: Рассказы. Ташкент, 1964; Пора возвращения аистов: Повесть и рассказы. Ташкент, 1979; Горизонт. М., 1986.

Літ.: Владимирова Н.В. Мастерство Саида Ахмада. Ташкент, 1973.

Сайгак.

САЙГА́КІ (Saiginae), падсямейства млекакормячых сям. пустарогіх атр. парнакапытных. 2 роды, 2 віды: сайгак, або сайга (Saiga tatarica), і аронга, або чыру (Pantholops hodgsoni). Аронга пашырана ў высакагор'ях Тыбета, сайгак — у Сярэдняй і Цэнтр. Азіі, Перадкаўказзі, Ніжнім Паволжы. Жыве статкамі ў стэпах і паўпустынях, робіць сезонныя вандроўкі. Празмерным промыслам да пач. 20 ст. сайгак быў амаль вынішчаны; у выніку ахоўных мер колькасць яго пагалоўя аднавілася.

У сайгака даўж. самцоў да 146 см, выш. ў карку да 80 см (у аронга да 100 см), маса да 50 кг; самкі драбнейшыя. Афарбоўка спіны і бакоў жаўтаватая, бруха белае. Галава вял., нос доўгі, рухавы, хобатападобны. Рогі светла-жоўтыя, паўпразрыстыя, даўж. да 40 см; самкі бязрогія. Расліннаедныя. Палігамы. Нараджаюць звычайна 2 дзіцянят. Аб'ект абмежаванага промыслу.

САЙГЁ (сапр. Сата Нарыкіё; 1118—1190), японскі паэт. Быў афіцэрам гвардыі; пакінуўшы службу, стаў вандроўным манахам. Зберагліся зб. яго паэзіі «Санкасю», у які ўвайшло больш за 1500 вершаў жанру *танка*, і твор па паэтыцы ў запісе яго вучня «Гутаркі з Сайгё» («Сайгё-дансе»). Паэзія С. глыбока філасофская, грунтуецца на асэнсаванні вобразаў прыроды; у ёй дамінуе журботны настрой.

Тв.: Рус. пер. — Горная хижина. СПб., 1999.

Л.П. Баршчэўскі.

САЙГО́Н (Saigon), назва горада *Хашымін* у В'етнаме да 1976.

САЙДА, горад на Пд Лівана. Адм. ц. мухафазы Паўд. Ліван. Вядомы з 4-га тыс. да н.э.; адзін з найстараж. фінікійскіх гарадоў-дзяржаў. Да 16 ст. наз. Сідон. Каля 300 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Порт на Міжземным м., канцавы пункт нафтаправода з Саудаўскай Аравіі, вузел аўтадарог. Прам-сць нафтаперапр. і харчовая. Гандл. цэнтр с.-г. раёна (цытрусавыя, аліўкі, вінаград, збожжавыя). Рыбалоўства. Археал. музей. Арх. помнікі: руіны фінікійскага храма і некропаля (10—5 ст. да н.э.); руіны замка св. Людовіка (12 ст.) і замка крыжаносцаў (13 ст.); вял. мячэць, караван-сарай (16—18 ст.). У горадзе і навакольлі — лагеры палесцінскіх бежанцаў.

САЙДАВЫ КІТ, гл. *Сейвал.*

САЙКО́ Аляксандр Пятровіч (н. 16.2.1954, в. Зубкі Клецкага р-на Мінскай вобл.), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (2000). Скончыў БДУ (1976). З 1976 у Ін-це фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў Нац. АН Беларусі (з 2001 заг. лабараторыі). Навук. працы па квантавай электроніцы, фізіцы цвёрдага цела. Развіў тэорыю кагерэнтных нелінейнаптычных з'яў у крышталях пры моцным электрон-фанонным узаемадзеянні. Даў тлумачэнне бістабільнасці пругкіх і цеплавых характарыстык у аксідных звышправадніках.

Тв.: Кооперативные нелинейнооптические явления... Мн., 1999; К теории лазерной генерации на вибронных переходах примесных кристаллов // Журн. эксперимент. и теорет. физики. 2001. Т. 119, вып. 2.

САЙКО́Ў Іван Паўлавіч (24.10.1911, г. Гомель — 13.2.1989), бел. і расійскі спявак (драм. тэнар). Нар. арт. Беларусі (1955). Вучыўся ў хар. студыі пры Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі (1938—39). Працаваў у т-рах муз. камедыі Беларусі. У 1949—56 саліст Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі, у 1956—77 — Саратаўскага т-ра оперы і балета. Валодаў выразным голасам шырокага дыяпазону, вял. драм. тэмпераментам, глыбока адчуваў характар вобраза. На бел. сцэне выконваў гал. драм. партыі класічнага і сучаснага рэпертуару. Сярод партый: Сяргей («Дзяўчына з Палесся» Я.Цікоцкага), Сабінін («Іван Сусанін» М.Глінкі), Герман, Вадэмон, Вакула, Андрэй («Пікавая дама», «Іаланта», «Чаравічкі», «Мазепа» П.Чайкоўскага), Самазванец («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Андрэй («Запарожац за Дунаем» С.Гулак-Арцямоўскага), Хазэ («Кармэн» Ж.Бізэ), Радамес («Аіда» Дж.Вердзі), Каніо («Паяцы» Р.Леанкавала), Каварадосі («Тоска» Дж.Пучыні), Стэфан («Страшны двор» С.Манюшкі), Енак («Прададзеная нявеста» Б.Сметаны),

І.П.Сайкоў.

Рыгор Мелехаў («Ціхі Дон» І.Дзяржынскага). У канцэртным рэпертуары бел. і рус. нар. песні, рамансы і інш.

І.В.Глушакоў.

САЙМА (Saimaa), сістэма азёр на ПдУ Фінляндыі ў паніжэннях стараж.-ледавіковага рэльефу. Пл. каля 4,4 тыс. км^2 (найб. воз. Сайма — каля 1,8 тыс. км^2), глыб. да 82 м. Берагі моцна парэзаныя,

І.Сайкоў у ролі Андрэя.

часта скалістыя. Шмат астравоў. Ледастаў са снежня па май. Сцёк у Ладажскае воз. па р. Вуокса. *Сайменскім каналам* злучана з Фінскім зал. Балт. мора. На астравах воз. Хаўківесі — нац. парк Лінансаары. Транспарціроўка лесу, суднаходства, рыбалоўства. Парты: Лапеэнранта, Саванліна, Мікелі, Іоэнсу.

САЙМАК (Simak) Кліфард Дональд (3.8.1904, г. Мелвіл, ЗША — 25.4.1988), амерыканскі пісьменнік-фантаст. Вучыўся ў Вісконсінскім ун-це. Працаваў настаўнікам, рэпарцёрам, рэдактарам газеты. Дэбютаваў у 1931. У навук.-фантаст. раманах «Касмічныя інжынеры» (1950), «Горад» (1952, Міжнар. прэмія па фантастыцы 1953), «Спярша ён памёр» (1952), «Кольца вакол Сонца» (1953), «Перасадачная станцыя» (1964), «Вы стварылі нас» (1969) і інш. праблемы распаду сучаснага тэхнакратызаванага грамадства, адчужэння бацькоў і дзяцей, небяспекі ядз. катастрофы, суіснавання розных форм розуму, неабходнасці мірных адносін паміж прадстаўнікамі розных цывілізацый, узаемадачыненняў навукі і маралі. Для яго твораў характэрны дынамізм дзеяння, глыбокі лірызм і мяккі гумар.

Тв.: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—5. М., 1992—93. *Е.А.Лявонава.*

САЙМАН (Simon) Герберт Александэр (н. 15.6.1916, г. Мілуокі, ЗША), амерыканскі эканаміст і псіхолаг, адзін з заснавальнікаў сац. мадэліравання. Навук. працы па выкарыстанні колькасных метадаў у эканоміцы і сацыялогіі, арганізацыі кіравання і планавання дзейнасці карпарацый і ўстаноў. Распрацаваў тэорыю і метадалогію прыняцця рацыянальных эканам. рашэнняў рознымі арг-цыямі. Выкарыстоўваў камп'ютэры пры аналізе паводзін людзей і грамадскіх сістэм. Аўтар твораў «Адміністрацыйныя паводзіны» (1947), «Мадэлі чалавека» (1957), «Арганізацыя» (1958) і інш. Нобелеўская прэмія 1978.

САЙМАНС (Simons) Генры Калверт (1899—1946), амерыканскі вучоны-эканаміст. Адзін з заснавальнікаў *Чыкагскай школы* ў палітэканоміі, прыхільнікі якой выступалі за захаванне «чыстай канкурэнцыі» і лічылі непажаданым дзярж. ўмяшанне ў эканам. жыццё. З 1939 праф. Чыкагскага ун-та. Навук. працы па праблемах развіцця грашова-крэдытнай сістэмы, бюджэтна-фін. і падатковай палітыкі. Аўтар твораў «Эканамічная палітыка для свабоднага грамадства» (1948), «Федэральная падатковая рэформа» (1950) і інш. Прапанаваў банкаўскую рэформу (1930-я г.), якая прадугледжвала скарачэнне грашовага абароту, спыненне абясцэньвання грошай і прадухіленне банкруцтва банкаў. Распрацаваў праект рэформы, паводле якой асн. крыніцай федэральных даходаў станавіўся падаходны падатак з грамадзян (20% ад усіх відаў даходаў) і скарачаліся ўскосныя падаткі.

САЙМЕНСКІ КАНАЛ, водны шлях міжнар. значэння на тэр. Фінляндыі і Расіі, на Карэльскім перашыйку. Злучае воз. Сайма ў раёне г. Лапеэнранта з Фінскім зал. Балтыйскага м. каля г. Выбарг. Створаны ў 1856, рэканструяваны ў 1967—69. Даўж. 43 км, на тэр. Расіі — 29 км. Глыб. на фарватары 4,2 м, 8 шлюзаў. Сістэмай водных шляхоў і каналаў злучаны з г. Хельсінкі і партамі Батнічнага зал. (Поры, Раўма). Паводле дагавора 1962 рас. ч. канала перададзена ў арэнду Фінляндыі на 50 гадоў.

САЙРА (Cololabis saira), рыба сям. макрэлешчупаковых. Пашырана ў Ціхім ак., ва ўмеранай і субтрапічнай зонах Паўн. паўшар'я. Жыве ў адкрытых водах уздоўж узбярэжжаў Азіі і Амерыкі. Трымаецца чародамі.

Даўж. да 40 см, маса да 200 г. Цела падоўжанае, укрыта дробнай луской. Шкілет зялёнага колеру з-за наяўнасці пігменту білівердзіну. Паміж спінным і хваставым, анальным

Сайра.

і хваставым плаўнікамі — шэраг дробных плаўнічкоў. Рот вял., сківіцы доўгія. Корміцца планктонам. Аб'ект промыслу.

САЙТ (ад англ. site месцазнаходжанне) у генетыцы, участак нуклеатыднай паслядоўнасці ў малекуле ДНК, здольны да *мутацыі*. Кожны С. адпавядае пэўнай пары нуклеатыдаў у двухланцужковай малекуле ДНК ці аднаму нуклеатыду ў вірусаў, якія ўтрымліваюць генет. матэрыял у адной нітцы ДНК або РНК. У біяхіміі С. — участак амінакіслотнай паслядоўнасці ў малекуле бялку. *Р.Г.Заяц.*

Л.**Сайферціс**. Некалі! З серыі «Абарона Севастопаля». 1941.

САЙТ, электронная публікацыя ў сусветнай інфарм. прасторы WWW (ці Web, скар. ад англ. World Wide Web сусветная павуціна), даступная карыстальнікам *Інтэрнета*. Уяўляе сабой сукупнасць тэматычна звязаных Web-старонак, якія адносяцца да аднаго аўтара, праблемы, установы, прадпрыемства ці інш. Бывае любога памеру і зместу (тэкст, графіка, анімацыя, гук, відэа і інш.). Размяшчаецца на вузлавым камп'ютэры з пастаянна дзеючай праграмай Web-сервер. Падрыхтоўка С. для распаўсюджвання ў Інтэрнеце ажыццяўляецца па спец. Web-тэхналогіі з выкарыстаннем мовы разметкі гіпертэкставых дакументаў. Доступ да С. выконваецца па канкрэтным адрасе; пошук, прагляд, навігацыя па спасылках і раздрукаванне С. адбываюцца з дапамогай спец. праграм.

А.І.Боскіна, А.В.Нікіфараў.

САЙФЕ́РЦІС Леанід (Веньямін) Уладзіміравіч (14.11.1911, г. Ільінцы Вінніцкай вобл., Украіна — студз. 1996), расійскі графік. Нар. маст. Расіі (1982). Нар. маст. СССР (1996). Чл.-кар. АМ СССР (1966). Вучыўся ў Харкаўскім маст. ін-це (1928—30). З 1930 у Маскве. Супрацоўнічаў з газ. «Комсомольская правда», час. «Смена», «Огонек» і інш., з 1934 у час. «Крокодил». Станковыя творы вызначаюцца абагульненай лаканічнасцю лінейнага штрыха, мяккай празрыстасцю колеравых плям, вастрынёй кампазіцыйных ракурсаў, карыкатуры — мяккім гумарам. Аўтар серый «Старая Масква» (1938), «Абарона Севастопаля» (1941), «Берлін» (1945), «Метро» (1957), «Маскоўскія жанры» (1966—67), «Спорт» (1967—70), «Новыя раёны Масквы» (1970-я г.) і інш.

Літ.: Семенова Т. Л.В.Сойфертис. М., 1962; Гурьева Т.Г. Л.В.Сойфертис. Графика: [Альбом]. М., 1973.

САК, у беларусаў традыц. рыбалоўная прылада; стаўная пастка ў выглядзе сеткавага мяшка, прывязанага да драўлянага абруча ў форме паўкруга, да якога пасярэдзіне прымацоўвалі доўгую ручку. Распраўлены ў вадзе С. нагадвае конус, падзелены па даўжыні папалам.

Рыбачаць С. уброд і з лодкі. Адкрытай часткай падводзяць да куста ці да травы і заганяюць у яго рыбу шастом або нагамі. Выкарыстоўваюць пераважна для лоўлі рыбы ў рэках. Вядомы па ўсёй Беларусі.

САК Аляксандр (14.8.1890, Навагрудчына — пасля 1937), удзельнік бел. нац.-рэліг. руху пач. 20 ст. Вучыўся ў Пецярбургскім ін-це лясной гаспадаркі, з 1913 у Магілёўскай духоўнай каталіцкай семінарыі. У 1917 пасвячоны ў святара. Душпастырскую дзейнасць вёў у Магілёўскай губ., на Міншчыне, Мазыршчыне, у Койданаве, Хойніках. Удзельнік з'езда бел. каталіцкіх святароў у Мінску (24.—25.5.1917), чл. саюза ксян-

дзоў-беларусаў. Прыхільнік беларусізацыі рэліг. жыцця беларусаў-католікаў. З-за праследаванняў сав. улад у 1929 вымушаны быў адмовіцца ад святарскага сану. Працаваў у Бел. дзярж. выд-ве, займаўся літ. творчасцю. 24.6.1930 арыштаваны па справе т.зв. «*Саюза вызвалення Беларусі*», у 1930—34 на будаўніцтве Беламорска-Балтыйскага канала. У 1937 зноў арыштаваны, прыгавораны да вышэйшай меры пакарання.

Літ.: Беларускія рэлігійныя дзеячы XX ст.: Жыццярысы, мартыралогія, успаміны. Мн.; Мюнхен, 1999.

САКА (Sacco) Джузепе (Юзаф; 1735, г. Верона, Італія — 22.12.1798), архітэктар, прадстаўнік архітэктуры барока і класіцызму. Працаваў на Беларусі. З 1773 у Гродне, прыдворны архітэктар графа А.Тызенгаўза (1774), гал. архітэктар па буд-ве каралеўскіх мануфактур ВКЛ. Кіраваў буд. школай на *Гарадніцы* ў Гродне. У Гродне пабудаваў Аўгустоўскую сядзібу (1770-я г.), удзельнічаў у афармленні інтэр'ераў і рэканструкцыі *Гродзенскага палаца Тызенгаўза* (з арх. Ю.Мёзерам), *Гродзенскага Новага замка*, езуіцкага касцёла (1773), ратушы (1775, з арх. Фрэйліхам). Сярод інш. пабудоў: *Свяцкі палацава-паркавы ансамбль*, палац *Станіславоўскай сядзібы, Шчорсаўскі палацава-паркавы комплекс* (з арх. К.Спампані). Працаваў таксама ў г. Паставы Віцебскай вобл. (1770-я г.), вёсках Ішчална Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. (1776), Добасна Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. (1781). Стварыў праект ратушы ў Вільні (1784, не ажыццёўлены).

В.Ф.Марозаў.

САКАВІК (назва ад слова сок; пачынаецца рух сокаў у дрэвах), бел. назва 3-га месяца каляндарнага года (31 дзень), пачатак *вясны*. 15 С. працягласць дня ў Мінску 11 гадз 46 мін, выш. Сонца над гарызонтам у поўдзень 33,9°. Сярэдняя сума сонечнай радыяцыі за месяц 291 МДж/м^2, радыяцыйны баланс 60 МДж/м^2. На тэр. Беларусі сярэднямесячная т-ра паветра -1,6 °С (-0,3 °С на Пд, -3,4 °С на ПнУ). Адносная вільготнасць 76—82%, колькасць вільготных дзён 8—13. Ападкаў 33—42 мм. У 2-й пал. С. адбываецца пераход сярэднясутачнай т-ры паветра праз 0°С у бок павышэння, пачынаецца раставанне снегу і адтаванне глебы. Растałыя воды выклікаюць разводдзі на рэках. У сярэдзіне С. на Пд пачынаецца рух сокаў ў клёна вастралістага, у канцы месяца — у бярозы павіслай. Зацвітаюць падбел звычайны, вольха шэрая, ляшчына, ваўчаягада. Вяртаюцца з выраю шпакі, жаваранкі. У канцы С. пачынаецца ток глушцоў, цецерукоў. Паяўляецца прыплод у вавёрак, зайчых. Прачынаюцца ад зімовай спячкі мядзведзі, барсукі. Пачынаецца веснавая лінька звяроў. На палях вядуцца падкормка азімых і веснавое ворыва. У садах фарміруюць кроны дрэў, вядуць барацьбу са шкоднымі насякомымі.

САКАВІТЫЯ КАРМЫ́, сакаўныя кармы, раслінныя кармы з вял. колькасцю вады (больш за 70%), якая знаходзіцца ў звязаным стане. Да іх належаць *зялёныя кармы, сілас*, кармавыя караняплоды (буракі, турнэпс, бручка), клубні (бульба, тапінамбур), бахчавыя культуры (гарбузы, кавуны, кабачкі). Скормліваюцца ў сырым выглядзе. Станоўча ўплываюць на абмен рэчываў, страваванне, малочную прадукцыйнасць («малакагонныя» кармы; у іх лізіну і трыптафану больш, чым у зерневых кармах), спрыяюць лепшаму засваенню грубых кармоў. Маюць адносна нізкую агульную пажыўнасць: ад 0,1 да 0,3 *кармавых адзінак* у 1 кг корму. У сухім рэчыве пераважаюць лёгкараствараль ныя вугляводы (крухмал і цукар). С.к. (за выключэннем бабовых раслін і сіласу з іх) бедныя пратэінамі (1—1,5%), клятчаткай (1—1,5%) і амаль не маюць тлушчаў. У попеле пераважаюць солі калію і натрыю; кальцыю і фосфару 0,03—0,04%. С.к. багатыя вітамінамі С, групы В, некат. (напр., гарбузы, морква, зялёны корм, сілас) — каратынам. Найб. рацыянальнае выкарыстанне С.к. у летні перыяд пры арганізацыі *зялёнага канвеера*.

САКАВІЦКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1919 у Карэі, серыя нар. выступленняў супраць яп. панавання ў Карэі (краіна была анексіравана Японіяй у 1910). Штуршком да адкрытага нар. выступлення паслужыла *Парыжская мірная канферэнцыя* 1919—20, якая выклікала ў кар. грамадстве надзеі на аднаўленне краіны. У лют. 1919 члены рэліг.-паліт. арг-цыі Чхандагё на чале з Сон Бёнхі выдалі дэкларацыю аб незалежнасці Карэі. 1 сак., напярэдадні пахавання б. імператара Карэі Каджона, у Сеуле, Пхеньяне і інш. гарадах адбыліся антыяп. дэманстрацыі ў падтрымку незалежнасці краіны. Рэпрэсіі ўлад выклікалі ў сак.—крас. ўзбр. супраціўленне амаль ва ўсёй Карэі. Паўстанне ахапіла 211 з 218 паветаў; у ім прынялі ўдзел больш за 2 млн. чал. У Шанхаі (Кітай) група кар. эмігрантаў стварыла часовы ўрад Карэі на чале з *Лі Сын Манам*. Яп. войскі і паліцыя задушылі паўстанне. Аднак каланізатары былі вымушаны замяніць яп. ваен. адміністрацыю цывільнай, дапусціўшы ў яе склад прадстаўнікоў кар. эліты.

Літ.: Пак Б.Д., Пак Тхэгын. Первомартовское движение 1919 г. в Корее: Глазами российского дипломата. М.; Иркутск, 1998.

В.У.Адзярыха.

САКАВІЦКІЯ АРТЫ́КУЛЫ 1654, Артыкулы Войска Запарожскага, акт, які юрыдычна аформіў далучэнне Украіны да Рас. дзяржавы паводле рашэння *Пераяслаўскай рады 1654*. Складзены гетманам Б.*Хмяльніцкім* ад імя Войска Запарожскага і прадстаўлены ў Маскве ўкр. пасольствам цару *Аляксею Міхайлавічу*, які 31 сак. зацвердзіў іх і 6 крас. дапоўніў спец. граматай. Паводле С.а. (23 пункты) Украіна ўваходзіла ў «вечнае падданства» да цара і яго нашчадкаў, але захоўвала пэўную аўтаномію — выбарнасць гетмана, яго права прымаць і адпускаць паслоў замежных краін (акрамя Рэчы Паспалітай і Турцыі) пры інфармаванні цара пра змест перагавораў, асобны казацкі суд, недатыкальнасць казацкіх маёнткаў, самакіраванне гарадоў і інш. Колькасць казацкага войска на службе ў цара вызначалася ў 60 тыс. чал. Правасл. царква рабілася пануючай на Украіне. С.а. да 1720-х г. былі асновай для пацвярджэння правоў *Левабярэжнай Украіны* пры выбранні новых гетманаў.

Літ.: Голобуцкий В. Дипломатическая история освободительной войны украинского народа 1648—1654 гг. Киев, 1962.

Г.В.Прыбытка.

САКАВІЦКІЯ І́ДЫ, паводле старажытнарымскага календара 15 сакавіка. У гэты дзень у 44 да н.э. быў забіты Юлій *Цэзар*. Змоўшчыкі (арганізатарамі былі Лонгін Гай *Касій*, Марк Юній *Брут*, Дэцым Юній Альбін *Брут* і інш.), баючыся ўзмацнення манархічных памкненняў Цэзара, забілі яго ў будынку курыі Пампея (Рым) у дзень пасяджэння сената.

САКА́І, горад у Японіі, на Пд в-ва Хонсю, прамысл. спадарожнік г. *Осака*. Вядомы з 8 ст. Быў важнейшым портам краіны, вольным горадам (12—16 ст.). Каля 1 млн. ж. (2000). Трансп. вузел. Марскі порт. Прам-сць: каляровая і чорная металургія, нафтахім., маш.-буд., тэкстыльная. Традыц. вытв-сць метызаў. ЦЭС. Вядомы прыморскі парк «Хамадэра».

САКАЛДЗІ́НСКІ Уладзіслаў Сямёнавіч (28.12.1888, Мінск — 8.3.1976), бел. спартсмен і трэнер (цяжкая атлетыка, барацьба). Адзін з заснавальнікаў першага на Беларусі аддз. Усерас. спарт. т-ва «Санітас» (1913). Выступаў у цырку. З 1918 — трэнер па цяжкай атлетыцы, выкладчык фіз. культуры ў навуч. установах Мінска. 1-ы чэмпіён Мінска (1914) па франц. (грэка-рымскай) барацьбе ў сярэдняй вагавой катэгорыі і 1-ы чэмпіён Мінска і Беларусі (1924) па гіравым спорце (пяцібор'е) у паўцяжкай вагавой катэгорыі. Рэкардсмен Расіі (1913, Мінск) у жыме (214 фунтаў — 85,6 кг) для штангістаў сярэдняй вагавой катэгорыі.

САКАЛІ́ШЧА, вёска ў Расонскім р-не Віцебскай вобл., каля р. Нішча, на аўтадарозе Полацк—Клясціцы. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 26 км на ПдЗ ад г.п. Расоны, 133 км ад Віцебска, 23 км ад чыг. ст. Боркавічы. 324 ж., 132 двары (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік Я.П.*Кульневу*. У вёсцы ў Вял. Айч. вайну дзейнічала адна з груп *Сакалішчанскага патрыятычнага падполля*.

САКАЛІ́ШЧАНСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў ліп. 1941 — чэрв. 1942 на базе Сакалішчан-

скага знішчальнага атрада на тэр. Віцебскай вобл. Налічвала 10 груп (49 чал., арганізатары і кіраўнікі П.А.Куксёнак, Л.А.Папкоўскі): у вёсках Аляксееўцы і Пярэкі (кіраўнік І.Р.Конышаў), Боркавічы (І.Р.Каваленка), Буракова (Я.П.Кураш), Залессе (С.Р.Казачонак) Дрысенскага, вёсках Дубініна (В.В.Гушчанка), Латышова (П.А.Саўчанка), Лунёва (П.С.Шчадроў), Сакалішча (Л.Ф.Гатоўскі), Царкавішча (цяпер Кульнёва, тут знаходзіўся штаб падполля; Ф.А.Кухаронак) Расонскага і в. Кацельна (П.М.Казлоў) Полацкага р-наў. Мела сувязь з *Расонскім патрыятычным падполлем*, партыз. 1-й і 2-й Дрысенскімі брыгадамі, спец. атрадам «Баявы». Падпольшчыкі праводзілі агітработу сярод насельніцтва, распаўсюджвалі лістоўкі і звесткі Саўінфармбюро, збіралі зброю, зрывалі мерапрыемствы акупац. улад. У барацьбе з ням. фашыстамі загінула 19 чал. У в. Боркавічы Верхнядзвінскага р-на падпольшчыкам пастаўлены помнік.

САКАЛО́ВА, вёска ў Бярозаўскім р-не Брэсцкай вобл., каля аўтадарогі Мінск—Брэст. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 10 км на У ад горада і чыг. ст. Бяроза, 100 км ад Брэста. 790 ж., 244 двары (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — Свята-Багародзіцкая царква (1820).

САКАЛО́ВА Галіна Мікалаеўна (н. 19.7.1935, г. Камсамольск-на-Амуры Хабараўскага краю, Расія), бел. сацыёлаг і філосаф. Д-р філас. н. (1986), праф. (1990). Засл. работнік адукацыі Беларусі (1999).

Скончыла Разанскі політэхн. ін-т (1959). З 1978 у Ін-це філасофіі і права АН Беларусі (з 1984 заг. аддзела). З 1989 заг. аддзела Ін-та сацыялогіі Нац. АН Беларусі. Заснавальнік бел. навук. школы сацыялогіі працы і эканам. сацыялогіі. Навук. працы па эканам. сацыялогіі, праблемах працы, прафес. культуры, сац. развіцця. Распрацавала метадалагічныя асновы тэорый сацыялогіі працы і эканам. сацыялогіі, абгрунтавала ўзаемасувязь гэтых тэорый.

Тв.: Труд и профессиональная культура. Мн., 1980; Культура труда в социальном развитии рабочего класса. Мн., 1984; Культура труда в социальном развитии технической интеллигенции. Мн., 1989; Экономический образ мышления: Реальность и перспективы. Мн., 1994 (у сааўт.); Социальные механизмы регулирования рынка рабочей силы. Мн., 1998 (у сааўт.); Экономическая социология. 2 изд. М.; Мн., 2000; Социология труда. Мн., 2000; Рынок труда и механизмы его регулирования. Мн., 2001 (у сааўт.).

САКАЛО́ВА Тамара Міхайлаўна (н. 20.4.1950, г. Мюльдорф, Германія), бел. мастак. Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1972). У 1973 выкладала ў Бабруйскім маст. вучылішчы, у 1974 працавала на Мінскім маст. камбінаце, з 1975 на Барысаўскім камбінаце прыкладнога мастацтва. З 1988 чл. творчага аб'яднання «Нямігa—17». Працуе ў кераміцы. Аўтар гарэльефа «Купальская ноч» і пано для рэстарана «Папараць-кветка» ў г. Маладзечна (1984), дэкар. скульптуры «Танец» для Палаца культуры ў г. Мазыр (1985), «Хімеры», «Вартавы» для Дома творчасці Бел. саюза тэатр. дзеячаў у в. Астрашыцкі Гарадок Мінскага р-на (1988). Аўтар керамічных пластоў і скульптур, часта афарбаваных у адзін або кантрастныя колеры. Ім уласцівы геаметрычнасць формаўтварэння, архітэктанічнасць, канцэптуальны падыход да вырашэння ідэі: цыклы «У прасторы сіняга» («Танга», кампазіцыі «З'яўленне», «Джаз», усе 1994), «Спакуса» («Спакуснік», «Аракул», «Жоўты сабака», кампазіцыя «Вежы», усе 1995), «Пункт вяртання» («Гексаграма», «Чаргаванне», «Узаемадзеянне», «Хронас», «Белы зігзаг», «Чорны зігзаг», «Лесвіца», усе 1997), кампазіцыі «Вусень» (1998), «Множанне», «Злучэнне», «Меандр» (усе 1999), серыя «Трохмерныя аб'екты» (2001).

М.М.Пагранoўскі.

Т.**Сакалова**. Гексаграма. 1997.

САКАЛО́Ў Барыс Сяргеевіч (н. 9.4.1914, г. Вышні Валачок Цвярской вобл., Расія), расійскі геолаг і палеантолаг. Акад. Рас. АН (1968, чл.-кар. 1958). Герой Сац. Працы (1984). Скончыў Ленінградскі ун-т (1937), дзе і выкладаў у 1937—41 і 1945—58, з 1960 — у Новасібірскім ун-це. З 1958 у Ін-це геалогіі і геафізікі Сіб. аддз. АН СССР. З 1975 акад.-сакратар Аддз. геалогіі, геафізікі і геахіміі і чл. Прэзідыума АН СССР. Навук. працы па палеазойскіх каралах, страж. арганізмах пратэразою і кембрыю, гісторыі развіцця арган. свету і біясферы Зямлі ў дакембрыі, па праблеме біястратыграфічных межаў. Абгрунтаваў вылучэнне самага верхняга стратыграфічнага падраздзялення пратэразою — венду.

Тв.: Табуляты палеозоя Европейской части СССР: Введение. Ч. 1—4. Л.; М., 1951—55; Биохронология и стратиграфические границы // Проблемы общей и региональной геологии. Новосибирск, 1971; Вендский этап в истории Земли // Палеонтология. М., 1972.

САКАЛО́Ў Дзмітрый Іванавіч (1788, С.-Пецярбург — 1.12.1852), расійскі геолаг. Чл. Пецярбургскай АН (1839). Скончыў Горны кадэцкі корпус у Пецярбургу (1805), дзе і выкладаў да 1841, адначасова (у 1822—44) — праф. Пецярбургскага ун-та. Навук. працы па геалогіі, мінералогіі і палеанталогіі, у т.л. «Дапаможнік па мінералогіі» (ч. 1—2, 1832) і «Курс геагнозіі» (ч. 1—3, 1839). Абгрунтаваў вылучэнне чырвонакаляровых адкладаў Перадуралля ў самаст. сістэму (у 1841 англ. вучоны Р.І.Мурчысан назваў яе пермскай). Кіраваў работамі па геал. здымцы горных акруг Урала. Падрыхтаваў горна-геал. раздзел «Слоўніка царкоўнаславянскай і рускай мовы» (1847). Рэдактар «Горного журнала». Адзін з заснавальнікаў Мінералагічнага т-ва ў Пецярбургу (з 1817). З Дзямідаўскія прэміі Пецярбургскай АН.

САКАЛО́Ў Павел Пятровіч (27.6.1764, С.-Пецярбург — 6.10.1835), рускі скульптар; майстар дэкар. скульптуры класіцызму. Аўтар статуі «Малочніца з разбітым збаном» (1816) у парку г. *Пушкін*, фігур грыфонаў на Банкаўскім мосце, ільвоў на Львіным мосце (абодва цераз канал Грыбаедава), сфінксаў каля б. Егіпецкага моста цераз р. Фантанка (усе 1825—26) у С.-Пецярбургу.

САКАЛО́Ў Слава Макаравіч (н. 21.2.1937, Ерэван), бел. мастак манум.-дэкар. мастацтва. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1967), у 1968—79 выкладаў у ім. Працуе ў мазаіцы, габелене, маст. афармленні інтэр'ераў. Сярод лепшых работ: мазаікі на ўнутр. паверхні Кальца Славы Кургана Славы Сав. Арміі—вызваліцельніцы Беларусі (1969), «Беларусь партызанская» на тарцы гасцініцы «Турыст» у Мінску (1973, з А.Кішчанкам), «Мір» на будынку абутковай ф-кі (1985), маст. афармленне (1975) і габелен «Квітней, Беларусь» (1981, з З.Літвінавай) у Палацы культуры аб'яднання «Хімвалакно» (усе ў Магілёве), сграфіта «Радзіма», «Космас», «Мы за мір» на жылых будынках у Мазыры (1976—78, з В.Мігалем), дэкар. рэльеф у інтэр'еры Нац. акад. т-ра імя Я.Коласа ў Віцебску (1985, з Г.Несцеравым). Працуе таксама ў станковым жывапісе.

САКАЛО́Ў Сяргей Леанідавіч (н. 1.7.1911, г. Еўпаторыя, Аўтаномная Рэспубліка Крым, Украіна), савецкі дзярж. і ваен. дзеяч. Маршал Сав. Саюза (1978), Герой Сав. Саюза (1980). Скончыў Горкаўскае бранятанк. вучылішча (1934), Ваен. акадэміі бранятанк. і механізаваных войск (1947) і Генштаба (1951). У Чырв. Арміі з 1932. З 1934 у танк. войсках на Д. Усходзе, удзельнік

баёў на воз. Хасан (1938). У Вял. Айч. вайну нач. штаба ўпраўлення камандуючага бранятанк. і механізаванымі войскамі Карэльскага фронту (1943), каманд. бранятанк. і механізаванымі войскамі 32-й арміі (1944). З 1947 камандзір танк. палка, нач. штаба танк. дывізіі, з 1952 камандзір механізаванай дывізіі, потым нач. штаба і камандзір аб'яднання. У 1960—64 нач. штаба — 1-ы намеснік каманд. войскамі Маскоўскай ваен. акругі. З 1964 1-ы нам. каманд., з 1965 каманд. войскамі Ленінградскай ваен. акругі. З 1967 1-ы нам. міністра, у 1984—87 міністр абароны СССР.

С.Л.Сакалоў.

Уладзіслаў Генадзевіч Сакалоў.

САКАЛО́Ў Сяргей Міхайлавіч (н. 3.2.1946, г. Чыта, Расія), бел. вучоны ў галіне мед. гігіены. Д-р мед. н. (1991), праф. (1996). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1975), з 1977 працаваў у ім, з 1997 у Бел. НДІ санітарыі і гігіены (дырэктар). Навук. працы па абгрунтаванні гігіенічных рэгламентаў якасці навакольнага асяроддзя, распрацоўцы сучаснай канцэпцыі ацэнкі і кіравання экалагічнай рызыкай з мэтай аховы здароўя, экалагічнай эпідэміялогіі.

Тв.: Шумовое загрязнение городов — акустический стресс населения. Мн., 1997 (разам з Л.А. Аляшкевічам, В.П.Філонавым); Профессиональные аллергозы. Мн., 1998 (разам з С.У.Федаровічам, В.П.Філонавым); Эколого-эпидемиологическая оценка риска для здоровья человека качества атмосферы. Мн., 2001 (у сааўт.).

САКАЛО́Ў Уладзімір Глебавіч, бел. этнограф і фальклярыст 2-й пал. 19 ст. Чл. Мінскага губернскага стат. к-та, Рус. геагр. т-ва. З 1863 жыў у Мінскай губ., потым працаваў у Тураве, Мазыры міравым пасрэднікам, надворным саветнікам, міравым суддзёю. Друкаваўся ў «Минских губернских ведомостях», «Минских епархиальных ведомостях» і інш. Аўтар артыкулаў: «Нарысы нораваў Барысаўскага павета», «Нарысы народных святкаванняў і маленняў на Палессі», «Палессе: Паездка на возера Князь-Жыд», «Ліст з Палесся» (усе 1869), «Тураўская кантата св. Іаану Хрысціцелю» (1879), «Дзе мошчы св. Кірылы Тураўскага?» (1884). Адзін з першых запісаў легенды пра Князь-возера. Рабіў этнагр. замалёўкі. *А.Ю.Лозка.*

САКАЛО́Ў Уладзімір Мікалаевіч (18.4.1928, г. Ліхаслаўль Цвярской вобл., Расія — 24.1.1997), рускі паэт. Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1952). Друкаваўся з 1948. Першая кніга — «Раніца ў дарозе» (1953). У зб-ках вершаў і паэм «На сонечным баку» (1961), «Змена дзён» (1965), «Розныя гады» (1966), «Снег у верасні» (1968), «Другая маладосць» (1971), «Гарадскія вершы», «Позняя раніца» (абодва 1977), «Дзякуй, музыка» (1978), «Сюжэт» (1980, Дзярж. прэмія СССР 1983), «Новыя часы» (1986), «Наведванне» (1992) і інш. паэтызацыя штодзённага, непарыўнасць грамадзянскага і асабістага, тэмы горада, прыроды, кахання, узаемаадносін творцы і мастацтва, творцы і жыцця.

Тв.: Избр. произв. Т. 1—2. М., 1981; Избранное. М., 1989; Стихотворения. Поэмы. М., 1987; Стихи Марианне. М., 1996.

САКАЛО́Ў Уладзіслаў Генадзевіч (28.12.1908, г. Рыбінск Яраслаўскай вобл., Расія — 1993), расійскі харавы дырыжор, кампазітар, педагог. Нар. арт. СССР (1966). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1936). Вучань А.*Аляксандрава*, Дз.*Кабалеўскага*. З 1936 арганізаваў і ўзначаліў Дзіцячы хор пры Цэнтр. доме маст. выхавання дзяцей, выкладаў у Маскоўскай кансерваторыі (з 1951 праф., у 1957—60 і з 1980 заг. кафедры). Адначасова ў 1946—52 хормайстар *Ансамбля песні і танца Расійскай Арміі*, у 1956—88 арганізатар і маст. кіраўнік Дзярж. маскоўскага хору. У рэпертуары хар. творы розных эпох, стыляў, жанраў. Сярод яго твораў хар. цыклы, апрацоўкі рус. нар. песень. Аўтар кн. «Работа з хорам» (3-е выд. 1967) і падручніка (у сааўтарстве). Сярод вучняў М.*Кутузаў*, У.*Мінін*, Г.*Панцюкоў*. Дзярж. прэмія Расіі 1979.

Літ.: В.Соколов: Дирижер, педагог, композитор. М., 1988. *Л.А.Шымановіч.*

САКАЛО́Ў Юрый Мацвеевіч (20.4.1889, г. Нежын Чарнігаўскай вобл., Украіна — 15.1.1941), рускі і ўкр. фальклярыст і літ.-знавец. Акад. АН Украіны (1939). Скончыў Маскоўскі ун-т (1911). У 1911—25 выкладаў у гімназіях і ВНУ Масквы. З 1939 дырэктар Ін-та фальклору АН Украіны. Складальнік фальклорных зб-каў: «Казкі і песні Белазерскага краю» (1915), «Паэзія вёскі» (1926; абодва з Б.М.Сакаловым), «Былiны» (1937), «Народная лірыка» (1939), «Анежскія былiны» (выд. 1948) і інш. Аўтар прац «Слова аб палку Ігаравым» і народная творчасць» (1936), «Рускі фальклор» (1941). У некат. працах выкарыстоўваў бел. фальклор.

САКАЛО́Ў Яфрэм Яўсеевіч (н. 25.4.1926, в. Равячына Горацкага р-на Магілёўскай вобл.), партыйны і дзярж. дзеяч Беларусі. Герой Сац. Працы (1986). Скончыў Бел. с.-г. акадэмію (1956), ВПШ пры ЦК КПСС (1961). З 1956 на гасп. і парт. рабоце ў Іванаўскім р-не Брэсцкай вобл., Казахстане. У 1965—77 старшыня Брэсцкага абкома прафсаюза рабочых і служачых сельскай гаспадаркі і нарыхтовак, сакратар Іванаўскага райкома, заг. аддзела ЦК КПБ, з 1977 1-ы сакратар Брэсцкага абкома, у 1987—90 1-ы сакратар ЦК КПБ. Чл. ЦК у 1976—87, Бюро ЦК КПБ у 1987—90. Чл. ЦК КПСС у 1986—90, Палітбюро ЦК КПСС у 1990—91. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1976—80, 1987—90. Чл. Прэзідыума Вярх. Савета СССР у 1987—91. Старшыня Вышэйшага савета КПБ (з 1997).

САКАЛО́ЎКА, вёска ў Язёрскім с/с Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Лабчанка, каля аўтадарогі Чэрыкаў—Слаўгарад. Цэнтр калгаса. За 15 км на ПдЗ ад г. Чэрыкаў, 92 км ад Магілёва, 47 км ад чыг. ст. Крычаў. 464 ж., 145 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

САКАЛО́Ў-СКАЛЯ́ Павел Пятровіч (3.7.1899, С.-Пецярбург — 3.8.1961), расійскі мастак. Нар. мастак Расіі (1956). Правадз. чл. АМ СССР (1949). Вучыўся ў студыі І.Машкова ў Маскве (1914—18) і маскоўскіх Вышэйшых маст.-тэхн. майстэрнях (1920—22). Старшыня аб'яднання «Быццё» (1920), чл. Асацыя-

П.Сакалоў-Скаля. Шлях з Горак. 1929.

цыі мастакоў рэв. Расіі (1926), маст. кіраўнік «*Окон ТАСС*» (1941—45). Выкладаў у Студыі ваен. мастакоў імя М.Грэкава (1935—41), маскоўскім ін-це прыкладнога і дэкар. мастацтва (1948—51), маст. ін-це (1953—60) і інш. Стварaў прасякнутыя рамант. пафасам гісторыка-рэв., батальныя і жанравыя карціны: «Пакаранне Сцяпана Разіна» (1923), «Таманскі паход» (1928), «Шлях з Горак» (1929), «Браты» (1932), трыпціх «Шчорс» (1938), «Краснадонцы» (1948). Аўтар серыі «Гады і людзі» (1930—31). Аформіў спектаклі «Іван Грозны» А.Талстога (1945), «Стварэнне свету» М.Пагодзіна (1945) у Малым т-ры; «Ад усяго сэрца» Г.Жукоўскага (1951) у Вял. т-ры ў Маскве; кнігі А.Фадзеева, Дз.Фурманава, П.Яршова і інш. Выступаў таксама як майстар панарам і дыярам (кіраваў аднаўленнем панарамы Ф.Рубо «Абарона Севастопаля», 1954—56). Дзярж. прэміі СССР 1942, 1949.

Тв.: Годы и люди: [Альбом]. М., 1959; Долг художника. М., 1963.

Літ.: Ястребов И.И. П.П.Соколов-Скаля. М., 1959.

САКАЛО́ЎСКІ Анатоль Міхайлавіч (н. 2.1.1937, в. Палікараўка Слуцкага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне траўматалогіі і артапедыі. Д-р мед. н. (1985), праф. (1990). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1960), з 1975 працаваў у ім, з 1998 у Бел. НДІ траўматалогіі і артапедыі (з 1999 заг. лабараторыі). Навук. працы па праблемах прыроджанай і набытай паталогіі тазасцегнавога сустава, у т.л. прыроджаным і паталаг. вывіху сцягна, асептычных некрозах, дэгенератыўна-дыстрафічных захворваннях.

Тв.: Хирургическое лечение заболеваний тазобедренного сустава. Мн., 1993 (разам з А.С.Крукам); Патологический вывих бедра. Мн., 1997 (разам з А.А.Сакалоўскім).

САКАЛО́ЎСКІ Васіль Данілавіч (21.7.1897, в. Козлікі Гродзенскай губ., цяпер Падляскае ваяв., Польшча — 10.5.1968), савецкі ваенны дзеяч, Герой Сав. Саюза (1945). Маршал Сав. Саюза (1946). Скончыў Ваен. акадэмію РСЧА (1921), Вышэйшыя акад. курсы (1928). У Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік грамадз. вайны 1918—20. З 1922 на штабной рабоце, у 1930—35 камандзір дывізіі БВА, потым у інш. ваен. акругах, з лют. 1941 нам. нач. Генштаба Чырв. Арміі. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 нач. штаба Зах. фронту, Зах. напрамку, камандуючы войскамі Заходняга фронту, нач. штаба 1-га Укр., нам. камандуючага войскамі 1-га Бел. франтоў. Удзельнік распрацоўкі *Смаленскай аперацыі 1943* і *Віцебска-Аршанскай аперацыі 1944*. Пасля вайны нам. галоўнакамандуючага, галоўнакамандуючы Групай сав. войск у Германіі. З 1949 1-ы нам. ваен. міністра, у 1952—60 нач. Генштаба — 1-ы нам. міністра абароны СССР. З 1960 у групе ген. інспектараў Мін-ва абароны СССР. Дэп. Вярх. Савета СССР з 1946. У Гродне імем С. названа вуліца, установлены бюст.

САКАЛО́ЎСКІ Міхаіл Паўлавіч (19.11.1887, г. Ржэў Цвярской вобл., Расія — 18.5.1977), бел. і рас. вучоны ў галіне хірургіі. Д-р мед. н., праф. (1922). Скончыў Маскоўскі ун-т (1911). З 1922 кіраўнік хірург. клінік Мінскага мед. ін-та. З 1936 кіраўнік хірург. клінік у Варонежскім і Адэскім мед. ін-тах, з 1965 навук. кансультант Адэскага мед. ін-та. Навук. працы па пытаннях агульнай і прыватнай хірургіі.

Тв.: Короткі падручнік па аперацыйнай хірургіі. Мн., 1932; Коллоидально-осмотическое давление сыворотки при хирургических заболеваниях // Вестн. хирургии им. И.И.Грекова. 1934. Т. 34, кн. 100.

В.Д.**Сакалоўскі**.

Н.Ф.**Сакалоўскі**.

САКАЛО́ЎСКІ Несцер Фёдаравіч (9.11.1902, в. Вешкі Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. — 13.11.1950), бел. кампазітар, хормайстар, фальклярыст. Скончыў Мінскі муз. тэхнікум (1931, кл. М.*Аладава*), вучыўся ў Бел. кансерваторыі (1932—35). З 1926 акцёр і хормайстар БДТ-3, з 1931 кіраўнік самадз. хораў. У 1937—41 адзін з арганізатараў і хормайстар *Ансамбля беларускай народнай песні і танца Беларускай філармоніі*. З 1943 маст. кіраўнік Палескага абл. ансамбля песні і танца, з 1944 нач. аддзела маст. самадзейнасці Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР, з 1946 ст. рэдактар рэдакцыі муз. л-ры Белдзяржвыдавецтва. Аўтар музыкі Дзярж. гімна БССР (верш М.*Клімковіча*), многіх хароў, песень на вершы Я.Купалы, Я.Коласа, П.Броўкі, А.Русака, М.Чарота і інш., інстр. мініяцюр, вак. сюіт на тэмы бел. нар. песень. Запісаў і апрацаваў больш за 500 бел. нар. песень (у т.л. «Ой ты, белая бярозанька», «Падушачка», «Чабарок», «Чаму зязюля не куквала») і найгрышаў.

Літ.: Нісневіч І.Г. Кампазітар Нестар Сакалоўскі. Мн., 1969.

Дз.М.Жураўлёў, Т.Г.Слабодчыкава.

САКАЛО́ЎСКІ Уладзімір Лявонцьевіч (н. 4.6.1930, в. Мяльканавічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. літаратуразнавец. Канд. філал. н. (1977). Скончыў Гродзенскі пед. ін-т (1953). Настаўнічаў. У 1962—69 працаваў перакладчыкам у ГДР. Выкладаў ням. мову ў Рыжскім ін-це інжынераў грамадз. авіяцыі (1971—78). У 1977—91 (з перапынкам) супрацоўнік Ін-та л-ры АН Беларусі, у 1991—94 у Нац. навук.-асветным цэнтры імя Ф.Скарыны. З 1993 прэзідэнт Бел.-ням. асацыяцыі культ.-асв. ініцыятыў. Друкуецца з 1972. Даследуе ўзаемасувязі і распаўсюджанне бел. л-ры за мяжой (манаграфіі «Пара станаўлення: Вопыт параўнальнага вывучэння беларускай і некаторых класічных зарубежных літаратур», 1986; «Беларуская літаратура ў ГДР», 1988). Адзін з аўтараў даследавання «Беларуская савецкая літаратура за мяжой» (1988). Аўтар арт. пра Р.Абіхта, І.Бехера, Г.Бідэра, І.В.Гётэ, А.Макміліна, М.Маскаліка, М.Нага, Н.Рандава і інш. З 1995 на пасадзе праф. Бонскага ун-та выконвае тэму ў 3 т. «Беларусь і Германія: Інтэлектуальна-культурныя адносіны (1914—1941)» (т. 1, 2000). Уклаў зб. на ням. і бел. мовах «Беларускія апавяданні» (2000). На бел. мову пераклаў працу А.Цеханавецкага «Міхал Казімір Агінскі і яго «сядзіба музаў» у Слоніме» (1993).

Літ.: Уладзімір Сакалоўскі: Біябібліягр. нарыс. Мн., 2000. *І.У.Саламевіч.*

САКАЛО́ЎСКІ Уладзімір Эдуардавіч (н. 13.9.1930, Мінск), бел. архітэктар. Засл. арх. Беларусі (1979). Канд. архітэктуры (1966). Скончыў БПІ (1958). З 1958 працаваў у ін-це «Белдзяржпраект», з 1965 гал. архітэктар, з 1972 дырэктар БелНДІдзіпрасельбуда. З 1965 адначасова выкладаў у БПА. У 1992—2000 гал. эксперт Галоўэкспертызы Мін-ва архітэктуры і буд-ва Беларусі. Асн. работы: праект дэталёвай планіроўкі і забудовы г. Салігорск, праекты дэталёвай планіроўкі зон адпачынку на Заслаўскім вадасховішчы і воз. Нарач (усе 1959—60), дом адпачынку на воз. Нарач (1959—61), будынак БелНДІдзіпрасельбуда і лабараторны корпус з-да імя Вавілава (1969) у Мінску, праект і забудова в. Малеч у Бярозаўскім р-не (1969—81, усе ў сааўт.).

Тв.: Архитектура Советской Белоруссии. М., 1973 (у сааўт.); Проектирование и строительство промышленных комплексов. Мн., 1975 (разам з І.Г.Малковым); Архитектура нового белорусского села. Мн., 1979 (разам з Р.М.Алімавым); Архитектура Советской Белоруссии. М., 1986 (у сааўт.).

САКАЛО́ЎСКІ-АРЛО́ЎСКІ Эдвард (псеўд. Тамаш Маліноўскі; 1878, Вільня — 18.4.1932), рэвалюцыянер, журналіст. У 1896—99 чл. сацыял-дэмакратыі Літвы, удзельнік віленскай нарады па пытанні ўтварэння СДКПіЛ (1899), II з'езда, на якім закончана афармленне СДКПіЛ (1900), III з'езда (1901) і II Краёвай канферэнцыі (1901) СДКПіЛ. Чл. Гал. праўлення СДКПіЛ (1900—01). У 1905 чл. Віленскага к-та СДКПіЛ, рэдактар газ. «Walka robotnicza» («Рабочая барацьба») і «Солдатская памятка». У 1906 кіраўнік Ваен.-рэв. арг-цыі абл. к-та Паўн.-Зах. саюза РСДРП. У 1910 рэдактар легальнага органа СДКПіЛ «Trybuna» («Трыбуна»). У 1907 і 1912 арыштаваны. У 1917 чл. Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У 1918—25 дзеяч Камуніст.

партыі Польшчы, у 1927—30 канд. у чл. яе ЦК. З 1926 у СССР — у Міжнар. агр. ін-це, у рэдакцыі газ. «Trybuna radziecka» («Савецкая трыбуна»).

В.С.Семенякоў.

САКАЛО́ЎШЧЫНА, вёска ў Галубаўскім с/с Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл., каля р. Свольна. Цэнтр калгаса. За 21 км на У ад г. Верхнядзвінск, 198 км ад Віцебска, 4 км ад чыг. ст. Свольна. 152 ж., 50 двароў (2001). Пач. школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

САКА́ЛЬСКІ Пётр Пятровіч (26.9.1832, г. Харкаў, Украіна — 11.4.1887), украінскі кампазітар, публіцыст, фалькларыст, муз.-грамадскі дзеяч. Скончыў Харкаўскі ун-т (1852). У 1859 аднавіў дзейнасць адэскага Філарманічнага т-ва, удзельнічаў у стварэнні Т-ва аматараў музыкі (1864, у далейшым Адэскае муз. т-ва) і муз. школы пры ім (1866). Яго оперы — адны з першых прафес. узораў укр. опернага мастацтва. Сярод муз. твораў: оперы «Мазепа» (1859), «Майская ноч» (1863), «Асада Дубна» (1878); кантата «Баль Пятра Вялікага» (1859); балада «Слухай» (1864); фп. (каля 40) і віяланчэльныя п'есы, рамансы (больш за 40), хары, песні і інш. У муз.-крытычных артыкулах адстойваў ідэі народнасці муз. мастацтва. Аўтар працы «Руская народная музыка, велікаруская і маларуская...» (1888). Збіраў і апрацоўваў нар. песні, у т.л. бел., шэраг з іх апублікаваны ў яго зб. «Маларасійскія і беларускія песні» (выд. 1903).

Літ.: Карышева Т.И. Петр Сокальский: Жизнь и творчество. М., 1984.

Т.Б.Варфаламеева.

САКА́Р'Я (Sakarya), рака на ПнЗ Турцыі. Даўж. 790 км, пл. басейна каля 65 тыс. км². Цячэ пераважна па Анаталійскім пласкагор'і, упадае ў Чорнае м. Зімовае разводдзе. Сярэдні расход вады каля 200 м³/с. ГЭС Сарыяр і Гёкчэкая. Выкарыстоўваецца для арашэння (пераважна ў ніжнім цячэнні). На С. — г. Адапазары.

САКА́ЎШЧЫНА, вёска ў Валожынскім р-не Мінскай вобл., каля р. Бярэзіна і *Сакаўшчынскага вадасховішча*, на аўтадарозе Валожын—Вішнева. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на З ад г. Валожын, 87 км ад Мінска, 18 км ад чыг. ст. Багданаў. 580 ж., 263 двары (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — царква (1878).

САКАЎШЧЫНСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. У Валожынскім р-не Мінскай вобл., каля в. Сакаўшчына. Створана ў 1937 на р. Бярэзіна (бас. р. Нёман) для энергет. мэт (Сакаўшчынская ГЭС, цяпер не працуе), у 1955 адноўлена. Пл. 1,3 км², даўж. 3,2 км, найб. шыр. 730 м, найб. глыб. 3,1 м, аб'ём вады 1,5 млн. м³. Берагі нізкія, пясчаныя, замацаваныя расліннасцю, у вярхоўі забалочаныя. У рэльефе ложа вылучаюцца 2 участкі: верхні — мелкаводны і ніжні — прыплацінны з глыб. больш за 1 м; на затопленым рэчышчы Бярэзіны глыб. больш за 2 м. Сярэднегадавая амплітуда ваганняў ўзроўню вады нязначная. Моцна зарастае. Гняздуюцца лебедзі. У вярхоўі вадасховішча вучэбная геагр. станцыя БДУ «Зах. Бярэзіна».

СА́КІ, горад у Аўтаномнай Рэспубліцы Крым, Украіна, на беразе Сакскага воз., за 4 км ад Чорнага м. Чыг. станцыя. Каля 40 тыс.ж. (2000). Хім. з-д, разліў мінеральнай вады, прадпрыемствы харч. прам-сці. Бальнеагразевы і кліматычны курорт, засн. ў 1828. Лета цёплае, зіма мяккая (т-ра ў лютым -1 °С). Асн. лек. фактары: высокаканцэнтраваная глеевая гразь і рапа Сакскага салёнага воз., мінер. крыніца з тэрмальнай (37—45 °С) хларыдна-гідракарбанатна-натрыевай вадой, якую выкарыстоўваюць для ваннаў, пітнога лячэння. Лечаць хваробы суставаў, нерв. сістэмы, гінекалагічныя. Сезон увесь год.

САКЛАКО́Ў Уладзімір Іванавіч (н. 20.2.1940, г. Чыта, Расія), бел. вучоны ў галіне нефралогіі. Д-р мед. н. (1987). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1969). З 1986 у Бел. НДІ кардыялогіі, з 2001 у Бел. мед. акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Навук. працы па лазератэрапіі хранічнай ныркавай недастатковасці, ацэнцы мэтазгоднасці гемадыялізу, дыягностыцы дыябетычнай нефрапатыі.

Тв.: Хроническая почечная недостаточность: интеграция и дифференциация лечения. Мн., 1993 (разам з В.С.Пілатовічам); Оценка эффективности гемодиализа методом спин-меченых зондов (у сааўт.) // Докл. Нац. АН Беларуси. 1999. Т. 43, №5.

СА́КЛЯ (ад груз. сахлі — дом), руская назва жылля горцаў Каўказа. С. звычайна каменныя (асабліва ў вайнахскіх народаў), глінабітныя або з саманнай цэглы, з плоскім дахам. Найб. характэрнае іх тэрасападобнае размяшчэнне на горным схіле; пры гэтым іх заднія сцены ўтвараюць схаваныя схілы гары, а дах адной С. можа служыць дваром для другой, што размешчана вышэй. Стараж. тып С. — 1-камернае жыллё без акон, з земляной падлогай, адкрытым агнішчам пасярэдзіне і дымавой адтулінай у даху. Сучасныя С. — шматпакаёвыя, з дашчанай падлогай, камінам або жал. печчу.

САКО́ВІЧ Антон Навумавіч (25.12.1895, б. хутар Новамацеева Лагойскага р-на Мінскай вобл. — 16.2.1982), генерал-лейтэнант інтэнданцкай службы (1946). Скончыў Вышэйшыя стралк.-тактычныя курсы (1931). У арміі з 1915, у Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік грамадз. вайны 1918—20. У 1931—37 у БВА. У Вял. Айч. вайну нач. тылу 11-й і 65-й армій, інтэндант Паўн.-Зах. фронту. Удзельнік вызвалення Калінкавіч, Мазыра, Бабруйска, Баранавіч, Слоніма, наступальных баёў на тэр. Усх. Прусіі, Памераніі, Берлінскай аперацыі. Пасля вайны да 1956 на адказных пасадах у Сав. Арміі.

САКО́ВІЧ Генадзь Віктаравіч (н. 13.4.1931, г. Чыта, Расія), расійскі хімік. Акад. Рас. АН (1992, чл.-кар. 1981). Герой Сац. Працы (1990). Скончыў Томскі ун-т (1953), дзе і працаваў. З 1959 у НВА «Алтай» (г. Бійск, з 1984 ген. дырэктар), адначасова ў Алтайскім політэхн. ін-це (з 1972 праф.). Навук. працы па агульнай і тэхн. хіміі. Распрацаваў навукова-тэхн. асновы стварэння кампазіцыйных энергаёмістых матэрыялаў з зададзенымі фіз.-хім. ўласцівасцямі. Сінтэзаваў новыя матэрыялы з выкарыстаннем энергіі выбуху. Дзярж. прэмія СССР 1970. Ленінская прэмія 1984. Дзярж. прэмія Рас. Федэрацыі 1994.

САКО́ВІЧ Касьян (свецкае імя Каліст; 1578?, в. Пацеліч Несцераўскага р-на Львоўскай вобл., Украіна — 1647), украінскі пісьменнік-палеміст, рэліг. дзеяч. Скончыў Кракаўскую і Замойскую акадэміі. У 1620—24 выкладчык, потым рэктар Кіеўскай брацкай школы. За рэдагаванне і выданне «Апалогіі...» М.Сматрыцкага (1628, на польскай мове) пракляты кіеўскім правасл. саборам. У 1641 перайшоў з уніяцтва ў каталіцызм, быў прапаведнікам у Кракаве. Пісаў на польскай, стараж. бел. і ўкр. мовах. Аўтар філас. трактата «Арыстоцелевы праблемы» і царк.-багаслоўскіх твораў, накіраваных супраць правасл. пісьменнікаў-палемістаў: «Трактат пра душу» (1625), «Кіеўскі сабор...», «Пра мытарствы», «Дыялог, або Размова Мацка з Дзянісам, папом схізматыцкім» (усе 1641), «Перспектывы» (1642). З паэт. спадчыны збярагліся «Вершы на жалобнае пахаванне... Пятра Канашэвіча Сагайдачнага, гетмана войска... запарожскага» (1622, на ўкр. мове), у якіх аўтар апявае яго гераічнае жыццё.

Літ.: Исаевич Я.Д. Преемники первопечатника. М, 1981; Wiszniewski M. Historya literatury polskiej. T. 8. Kraków, 1851; Siarczyński F. Obraz wieku panowania Zygmunta III... T. 2. Poznań, 1858.

У.Г.Кароткі.

САКО́ВІЧ (Sakowicz) Фабіян (6.11.1742—1787?), польскі паэт і перакладчык. Нарадзіўся на Беларусі. У 1759—62 вучыўся ў Віцебскім і Нясвіжскім езуіцкіх калегіумах. Выкладаў у Нясвіжы. З 1766 у Варшаве, у 1772—77 супрацоўнічаў у час. «Zabawy przyjemne i pożyteczne» («Прыемныя і карысныя забавы»), дзе апублікаваў большасць сваіх вершаў (некат. з іх прысвечаны ўраджэнцам і жыхарам Беларусі). На польскую мову пераклаў песні Гарацыя (т. 1—2, 1773—75). У 1777 памагаў А.Нарушэвічу перапісваць тэксты для яго «Гісторыі...». Жыў у яго маёнтку Павець каля Пінска. У 1778 пераехаў у в. Чарнаўчыцы (Камянецкі р-н Брэсцкай вобл.). *А.В.Мальдзіс.*

САКО́ВІЧЫ, шляхецкі род герба «Помян» у ВКЛ. Родапачынальнік Сак (Станіслаў) пры заключэнні *Гарадзельс-*

кай уніі 1413 быў адаптаваны да герба «Помян», у 1433 быў старостам дубінскім. Найб. вядомыя:

Андрэй (?—1465), сын Сака, староста троскі ў 1433—40, намеснік смаленскі ў 1440 і полацкі ў 1444—53, ваявода троскі з 1458. Адзін з кіраўнікоў войска ВКЛ у пераможнай бітве з маскоўскімі войскамі пад Сухадровам у 1445. Удзельнік перагавораў з крыжакамі ў 1432 і 1451, пасол у Чэхію ў 1453. Меў буйныя зямельныя ўладанні (каля 500 дымоў). Ад яго сына Юрыя пайшоў род Насілоўскіх. Багдан Андрэевіч (?—1491), намеснік браслаўскі ў 1463—74, маршалак гаспадарскі ў 1463—77, намеснік полацкі ў 1477—84, маршалак земскі з 1480, адначасова ваявода троскі з 1484. Быў паслом да крымскага хана Менглі-Гірэя ў 1473, у Маскву ў 1474 і 1482.

У.М.Вяроўкін-Шэлюта.

САКО́ЛЬНІКАЎ Рыгор Якаўлевіч (сапр. Брыльянт Гірш Янкелевіч; 15.8.1888, г. Ромны, Украіна — 21.5.1939), савецкі дзярж. і паліт. дзеяч, дыпламат і вучоны-эканаміст. Скончыў Парыжскі ун-т (1914). Чл. Камуніст. партыі (1905—36, адноўлены ў 1988), яе ЦК (1917—19, 1922—30, канд. у 1930—36), Палітбюро ЦК (1917, канд. у 1924—25). З 1917 чл. Маскоўскага к-та бальшавікоў і Петраградскага Савета, пам. камісара Дзярж. банка. Як старшыня сав. дэлегацыі падпісаў *Брэсцкі мір 1918*. У 1918—20 на ваен.-паліт. рабоце ў Чырв. Арміі. З 1920 старшыня Туркестанскай камісіі ВЦВК і СНК РСФСР і каманд. Туркестанскім фронтам. З 1921 у Наркамаце фінансаў. У 1922—26 нарком фінансаў РСФСР (з ліп. 1923 — СССР). Ініцыятар і актыўны ўдзельнік падрыхтоўкі і правядзення грашовай рэформы 1922—24 (увядзенне «цвёрдага» чырвонца і інш.), якая стабілізавала рубель і аднавіла разбураную ў час рэвалюцыі і грамадз. вайны фін. сістэму краіны. Удзельнік міжнар. фін.-эканам. канферэнцыі ў Гаазе (Нідэрланды, 1922). З 1926 нам. старшыні Дзяржплана СССР, з 1928 старшыня Нафтасіндыката. У 1929—32 паўпрэд СССР у Вялікабрытаніі, потым нам. наркома і чл. калегіі Наркамата замежных спраў СССР. У 1935—36 1-ы нам. наркома лясной прам-сці СССР. У 1936 арыштаваны, у 1937 па сфальсіфікаванай справе т.зв. «Паралельнага антысав. трацкісцкага цэнтра» асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны ў 1988.

Тв.: Новая финансовая политика: на пути к твердой валюте. М., 1995.

Літ.: Генис В.Л. «Упрямый нарком с Ильинки» // Открывая новые страницы... М., 1989.

М.Г.Нікіцін

САКО́ЛЬСКІ Аляксандр Кузьміч (6.12.1903, ст. Алексікава Нованіколаеўскага р-на Валгаградскай вобл., Расія — 14.11.1979), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, ген.-палк. артылерыі (1944), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Ленінградскую артыл. школу (1925), артыл. курсы ўдасканалення камсаставу (1933, 1937), Вышэйшыя акад. курсы пры Акадэміі Генштаба (1952). У Чырв. Арміі з 1921. У Вял. Айч. вайну з 1941 на фронце. У час Бел. аперацыі 1944 артылерыя 2-га Бел. фронту пад камандаваннем С. нанесла ўдары на рашаючых напрамках, што садзейнічала прарыву варожай абароны, фарсіраванню рэк Проня і Бася, выхаду да Дняпра і разгрому праціўніка. Да 1955 на камандных пасадах у Сав. Арміі, навук. рабоце.

САКО́ЛЬСКІ Аляксей Паўлавіч (5.11.1908, с. Каньгушы Ельнікаўскага р-на, Мардовія — 27.12.1969), бел. шахматыст; шахматны тэарэтык, літаратар і педагог. Майстар спорту СССР (1938). Засл. трэнер СССР (1965). Скончыў Ленінградскі пед. ін-т (1934). У 1950—52 трэнер зборнай каманды СССР — пераможцы шахматнай Алімпіяды (1952, Хельсінкі). У 1955—69 трэнер Бел. савета добраахвотнага спарт. т-ва «Спартак». Яго імем названы шахматны дэбют. З 1970 у Мінску праводзіцца мемарыял яго імя.

Тв.: Шахматная партия в ее развитии. Мн., 1966; Внимание, ловушка! М., 1970; Ваш первый ход. М., 1977.

САКО́ЛЬСКІ Іван, рускі паэт-класіцыст, перакладчык і педагог 18 ст. Нарадзіўся ў Кіржацкім р-не Уладзімірскай вобл. (Расія). Скончыў Пецярбургскую настаўніцкую семінарыю. У 1785—88 выкладчык у Славяна-грэкалацінскай акадэміі ў Маскве, у 1789—96(?) настаўнік Полацкага гал. нар. вучылішча, удзельнічаў у мясц. культ. жыцці. Выдаў у Маскве (1786, 1788) і Пецярбургу (1808) некалькі перакладных кніг і зборнікаў. Аўтар кн. «Кабінетны і купецкі сакратар, ці Збор найлепшых і ўжываемых пісьмаў» (1788, 2-е выд. 1795). Актыўны праваднік ідэй рус. асветніцтва, эстэт. прынцыпаў класіцызму на Беларусі. У одах, якія пісаў з нагоды падзей у жыцці вучылішча, даказваў карысць навук, рухальнай сілай прагрэсу лічыў асвету. У одзе ад 30.6.1794 апісаў голад на Беларусі, выказваў спачуванне да пакут народа.

Літ.: Мальдзіс А. Асветнік з Полацкага народнага // Мальдзіс А. Таямніцы старажытных сховішчаў Мн., 1974; Яго ж. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980. С. 273—277.

С.А.Кузняева.

САКО́ЛЬСКІ Канстанцін Іванавіч (28.5.1902, г. Брэст — 6.12.1969), інжынер-контр-адмірал (1944). Скончыў ваенна-марское вучылішча (1925), Спец. курсы камсаставу ВМС (1927), Ваенна-марскую акадэмію імя Варашылава (1934). У Чырв. Арміі з 1918, з 1921 у ВМФ. Удзельнік грамадз. вайны 1918—20. У Вял. Айч. вайну нам. начальніка мінна-тарпеднага ўпраўлення ВМФ на Балтыцы, р. Волга, Дунай, у час вайны з Японіяй 1945 на Амурскай флатыліі. Да 1957 на кіруючых пасадах у ВМФ.

САКО́ЛЬСКІ ПАВЕ́Т, Саколкаўскі павет, адм.-тэр. адзінка ў Рас. імперыі і Польшчы ў 19—20 ст. Утворана ў 1808 у складзе *Беластоцкай вобласці*, з 1843 у *Гродзенскай губерні*. Цэнтр — г. Саколка. Пл. 2290 кв. вёрст, нас. 88 719 чал. (без гарадоў, 1897), з іх 80% католікі, 16% праваслаўныя, каля 1,5% іудзеі. Падзяляўся на 13 валасцей: Астрагорская, Астроўская, Багнаўская, Грабянёўская, Зубрыцкая, Каменкаўская, Каменская, Круглянская, Макаўлянская, Нававольская, Раманаўская, Трафімаўская, Чарнавеская. У складзе павета былі заштатныя гарады Адэльск, Васількаў, Дамброва, Карышын, Кузніца, Новы Двор, Сухаволя і Янаў; усяго больш за 650 нас. пунктаў. У 1-ю сусв. вайну акупіраваны герм. войскамі. З канца 1918 у складзе адноўленай Польшчы, з 2.8.1919 у *Беластоцкім ваяводстве*. У вер. 1939 заняты Чырв. Арміяй. З 2.11.1939 у складзе БССР, з 4.12.1939 у Беластоцкай вобл. Скасаваны 15.1.1940.

Ю.В.Бажэнаў.

САКО́ТА, мусульманскае феадальна-тэакратычнае дзярж. аб'яднанне (халіфат) у Зах. *Судане* ў ніжнім цячэнні р. Нігер у 19 — пач. 20 ст. Створана ў выніку паўстання ў пач. 19 ст. народа фульбе пад лозунгам «свяшчэннай вайны» (гл. *Джыхад*) супраць правіцеляў дзяржаў хаўса. Да сярэдзіны 19 ст. ахоплівала землі сучасных Паўн. Нігерыі, Паўд. Нігера і Паўн. Камеруна. Складалася з эміратаў, многія з якіх толькі намінальна прызнавалі ўладу халіфа са сталіцай у г. Сакота. Пасля ваен. разгрому С. ў 1903 брыт. войскамі яго тэр. ўвайшла ў склад калан. уладанняў Вялікабрытаніі, Францыі і Германіі.

САКО́ТРА (Socotra, Sokotra), група астравоў у Індыйскім ак., на У ад мыса Гвардафуй (Афрыка), тэр. Емена. Пл. 3,6 тыс. км^2. Самы буйны — в-аў Сакотра (выш. да 1503 м). Складзены пераважна з крышт. парод. Клімат трапічны, сухі. Сярэднія т-ры студз. 21 °С, ліп. 28 °С. Ападкаў 250—300 мм за год. Паўпустынная расліннасць. На У і ў гарах — ксерафітная дрэвава-хмызняковая расліннасць. Вырошчванне фінікавай пальмы. Рыбалоўства. Гал. горад — Хадыбу (на в-ве Сакотра).

САКРАЛІЗА́ЦЫЯ (ад лац. sacralis свяшчэнны), наданне прадметам, з'явам, людзям свяшчэннага, рэлігійнага зместу; падпарадкаванне сац. ін-таў, культуры і быт. зносін рэліг. ўплыву. У аснове С. — вера ў існаванне свяшчэннага (сакральнага), процілеглага свецкаму. Сімвалам С. з'яўляецца цырымонія *асвячэння*, у выніку якой звычайная працэдура набывае трансцэндэнтны сэнс. У тэалогіі С. тлумачыцца як вытворнае ад Бога. Ням. тэолаг Р.Ота вызначаў сакральнае як адзіную адметную ўласцівасць божага, якая з'яўляецца сапраўдным коранем рэлігіі. Франц. сацыёлаг Э.Дзюркгейм лічыў, што сакральнае выяўляе натуральна-прыродную аснову

чалавецтва, яго грамадскую (калектывісцкую) сутнасць, якая супрацьстаіць індывідуалістычнаму існаванню. На розных этапах гіст. развіцця ступень распаўсюджанасці С. і яе характар былі неаднолькавыя. У ходзе гісторыі працэсам С. супрацьстаяла дэсакралізацыя (*секулярызацыя*) розных бакоў чалавечага існавання.

САКРАМЕ́НТА (Sacramento), рака на З ЗША. Даўж. каля 640 км (з р. Піт каля 960 км), пл. басейна 73 тыс. км^2. Вытокі на схілах гор Кламат, цячэ па паўн. ч. Каліфарнійскай даліны, упадае ў зал. Сан-Францыска, у вусці зліваецца з р. Сан-Хаакін. Зімовыя паводкі, вясенне-летняе разводдзе. Сярэдні расход вады на выхадзе з гор 314 м^3/с. Буйное вадасх. Шаста, ГЭС. Выкарыстоўваецца для арашэння. Суднаходная на 288 км ад вусця.

САКРАМЕ́НТА (Sacramento), горад на З ЗША. Адм. ц. штата Каліфорнія. Засн. ў 1839 як гандл. факторыя. Рост горада звязаны з «залатой ліхаманкай» 1840-х г. Цэнтр штата з 1854. 404,2 тыс ж., з прыгарадамі больш за 1,6 млн. ж. (1998). Вузел чыгунак і аўтадарог, рачны порт на р. Сакрамента. Міжнар. аэрапорт. Гандл. цэнтр паўн. ч. Каліфарнійскай даліны. Прам-сць: ракетна-касм. (выт-сць рухавікоў), радыёэлектронная, харч. (плодаконсервавая, мясная). 12 каледжаў і універсітэтаў. Музеі і галерэя мастацтваў.

САКРА́Т (Sōkratēs, 470—399 да н.э.), старажытнагрэчаскі філосаф. Жыў у Афінах. Удзельнічаў у ваен. дзеяннях, пасяджэннях «савета пяцісот», выконваў інш. грамадскія абавязкі. Абвінавачаны ў бязбожнасці, разбэшчванні моладзі і прыгавораны да пакарання смерцю. Адхіліў падрыхтаваныя сябрамі ўцёкі і прыняў атруту. Вызначыў новую задачу філасофіі як пазнанне чалавека ва ўсёй разнастайнасці яго духоўнага быцця, а не пазнанне прыроды. Пазнанне чалавека звязваў з самапазнаннем сябе як грамадскай і маральнай істоты. Спрабаваў даць вызначэнні агульным паняццям мудрасці, дабра, справядлівасці і інш.; падрыхтаваў аснову для далейшай распрацоўкі катэгарыяльнага апарату філасофіі. Свае ідэі выкладаў вусна ў выглядзе размоў, дыскусій. Лічыў, што напісаны тэкст «мёртвы» і ў значнай ступені скажае думку. Абгрунтаваў і распрацаваў метад дыялога як асн. сродку вызначэння ісціны і такія яго складаныя кампаненты, як іронія, маеўтыка, індукцыя. Яго паліт. погляды заснаваны на перакананні, што дзяржавай павінны кіраваць «лепшыя» — мудрыя і справядлівыя грамадзяне. Лічыў неабходным «бударажыць» грамадства, не дазваляючы грамадзянам займацца толькі звычайнымі справамі (узбагачэннем, кар'ерай і інш.). Выступаў за духоўнае развіццё чалавека, яго маральнае і інтэлектуальнае самаўдасканальванне. С. не стварыў цэласнай філас. сістэмы, але яго ўплыў на сусв. філасофію і духоўную культуру вельмі значны. Прадаўжальнік яго ідэй — *Платон*. Жыццёвы шлях С., яго асн. ідэі зафіксаваны ў працах стараж.-грэч. філосафаў Платона, Ксенафонта, Дыягена Лаэрцкага і інш. (гл. *Сакратычныя школы*).

Кр.: Платон. Апология Сократа. Критон // Собр. соч.: Пер. с греч. М., 1990. Т. 1.



Сакрат.

Літ.: Лосев А.Ф. История античной эстетики: Софисты. Сократ. Платон. М., 1994; Нерсесянц В.С. Сократ. М., 1996; Кессиди Ф.Х. Сократ. Ростов н/Д, 1999; Диоген Лаэртский. О жизни, учениях и изречениях знаменитых философов: Пер. с греч. М., 1995. *Т.І.Адула.*

САКРАТА́Р (ад позналац. secretarius першапачаткова — давераная асоба), 1) службовая асоба, якая вядзе справаводства ўстановы або асобы. 2) Складальнік пратакола сходу, пасяджэння. 3) Выбарны кіраўнік грамадскай, партыйнай або міжнар. арг-цыі. 4) Службовая асоба ў канцылярыі ВКЛ, якая непасрэдна займалася справаводствам вял. князя (кароля) і прызначалася ім. Упершыню ўпамінаецца ў 1407. Часам так называліся і вялікакняжацкія *пісары*. З 2-й пал. 16 ст. С. — асобная пасада, дзейнасць якой не абавязкова звязана са справаводствам (выконвалі абавязкі мернікаў, рэвізораў, паборцаў, памежных камісараў і інш.). Некат. С. вялі дакументацыю *Рады Вялікага княства Літоўскага*, што пазней рабілі рэгенты. С. вялікі духоўны — міністэрская пасада, асобная ад апарата канцлера і падканцлера ВКЛ. Утворана на сойме 1670. Прызначаўся каралём з духоўных асоб, вёў спецыяльна даручаныя справы. С. вялікі свецкі — міністэрская пасада. У пач. 16 ст. з тытулам «найвышэйшага сакратара ВКЛ» выступаў пісар І.С.Сапега, як мяркуецца, на ўзор адпаведнай пасады ў Польшчы. Сталая пасада С. вялікага свецкага ўстаноўлена ў ВКЛ на каранацыйным сойме 1764.

САКРАТАРЫЯ́Т ААН, адзін з галоўных органаў *Арганізацыі Аб'яднаных Нацый*, які дзейнічае пастаянна згодна са Статутам ААН. Асн. функцыя С. ААН — арганізац.-адм. абслугоўванне органаў структуры ААН, яе камітэтаў, канферэнцый. Выконвае адм.-тэхн. функцыі ААН, у прыватнасці, рыхтуе некат. матэрыялы; перакладае, друкуе і распаўсюджвае даклады, рэзалюцыі і інш. дакументы ААН; забяспечвае вусны пераклад прамоў, якія гаворацца на пасяджэннях гал. органаў ААН і іх дапаможных органаў; складае, друкуе і рассылае стэнаграфічныя і кароткія справаздачы пасяджэнняў; захоўвае дакументы ААН у архівах; рассылае ўсе дакументы *Генеральнай Асамблеі ААН, Савета Бяспекі ААН* і інш. членам ААН і выконвае інш. работу, якая можа быць ускладзена на яго гал. органамі ААН. С. ААН складаецца з *Генеральнага сакратара ААН* і прызначанага ім персаналу ў адпаведнасці з правіламі, якія ўстанаўліваюцца Ген. Асамблеяй. У апошні час агульная колькасць персаналу С. ААН складала больш як 50 тыс. чалавек з 175 краін. Знаходзіцца ў Нью-Йорку.

Г.А.Маслыка.

САКРАТЫ́ЧНЫЯ ШКО́ЛЫ, шэраг кірункаў у стараж.-грэч. філасофіі, якія грунтаваліся на вучэнні *Сакрата*. Засн. вучнямі Сакрата. Да С.ш. адносяцца: *Акадэмія платонаўская* (Платон, Спеўсіп, Ксенакрат і інш.), *кінікі* (Антысфен, Дыяген Сінопскі, Кратэт і інш.), *кірэнская школа* (Арыстып, Арыстып Малодшы, Арэта, Феодар і інш.), *мегарская школа* (Эўклід, Стылпон, Эўбулід і інш.), эліда-эратрыйская школа (Федон з Эліды, Менедэм і інш.).

САКРЫ́СТЫЯ (ад лац. sacrum святыня), бакавое памяшканне ў касцёле ці кляштары, прызначанае для захавання культавага начыння, адзення свяшчэннаслужыцеляў і інш.; часам тут захоўвалася і кляштарная казна. У раннехрысц. храмах функцыі С. выконвала пастафорыя, у правасл. — *рызніца*. Размешчана С. звычайна ва ўсх. ч. касцёла, непасрэдна каля месца правядзення службы. Зрэдку знаходзіцца паміж касцёлам і кляштарам. С. бываюць 1-павярховыя, перакрытыя скляпеннямі, радзей 2-павярховыя.

Сакрыстыя царквы Санта-Марыя прэса Сан-Сатыра ў Мілане. Арх. Д.Брамантэ. 1479—83.

САКРЭ́ТНЫЯ КАМІТЭ́ТЫ, часовыя вярхоўна-бюракратычныя ўстановы ў Рас. імперыі ў 1-й пал. 19 ст. Ствараліся імператарам Мікалаем I для абмеркавання праектаў рэформ. Сакрэтны характар дзейнасці быў абумоўлены боязню грамадскага хвалявання. Гал. пытаннем было сялянскае. Першы С.к. «6 снежня 1826» (фармальна дзейнічаў да 1832) пад старшынствам В.П.Качубея і М.М.*Спяранскага* створаны для выпрацоўкі агульнага плана дзярж. пераўтварэнняў, разглядаў і праекты асабістага вызвалення сялян. С.к. 1835—36 (гал. ролю адыгралі Спяранскі, Я.Ф.*Канкрын* і П.Дз.*Кісялёў*) абмяркоўваў пытанне аб паступовай замене прыгонных адносін дагаворнымі пры захаванні зямлі ў памешчыкаў. С.к. 1839—42 абмяркоўваў праект Кісялёва аб увядзенні *інвентароў*. С.к.1846 разглядаў запіску кіраўніка МУС Л.А.Пяроўскага пра абмежаванне прыгоннага права шляхам рэгламентацыі адносін унутры вотчыны; к-ты 1840 і 1844 займаліся пытаннем звальнення дворовых, 1847 і 1848 — выкупам сялян з маёнткаў, якія падлягалі публічным таргам. Некаторыя С.к. паўплывалі на змены ў заканадаўстве аб прававым становішчы асобных саслоўяў (1831, 1832, 1842, 1844). Вопыт С.к. улічаны пры выпрацоўцы *сялянскай рэформы 1861*; апошні С.к. 1857 пераўтвораны ў 1858 у *Галоўны камітэт па сялянскай справе*.

Літ.: Архипова Т.А. Секретный комитет 6 дек. 1826 // Тр. Моск. гос. ист.-арх. ин-та. М., 1965. Т. 20; Корнилов А.А. Курс истории России XIX в. М., 1993.

САКРЭ́ЦЫЯ (ад лац. secretio выдзяленне), утварэнне і вывядзенне рэчыва з клеткі ў вонкавае асяроддзе. Адрозніваюць вонкавую, або экзакрынную, С., пры якой рэчывы, што выдзяляюцца клеткамі (напр., страўнікавы сок, сліна, семянная вадкасць, малако), па вывадных пратоках паступаюць на паверхню цела ці органа, у полыя органы (напр., у страўнікава-кішэчны тракт, мочапалавую сістэму) і ўнутр., эндакрынную, калі рэчывы з клетак паступаюць у кроў і лімфу. Вылучаюць таксама С. мераакрынавую (найб. агульны тып, адбываецца без разбурэння клеткі), апакрынавую (адарванне ч. плазматычнай мембраны разам з сакрэтам і некат. ч. цытаплазмы) і галакрынавую (разбурэнне клеткі і яе адарванне разам з сакрэтам ад эпітэлію). Сакрэты бываюць рознай хім. прыроды: гармоны, ферменты, медыятары, іоны. Іх колькасць і састаў рэгулююцца нерв. механізмамі з удзелам гумаральных фактараў. *А.С.Леапцюк.*

САКРЭ́ЦЫЯ ў мінералогіі, мінеральны агрэгат акруглай або ізаметрычнай формы, што запаўняе пустоты ў горных пародах. Паводле мінер. саставу адрозніваецца ад умяшчальных парод. У процілегласць *канкрэцыям* С. ўтвараюцца шляхам паслядоўнага адкладу мінер. рэчыва (з сапраўдных і калоідных растворaў пры гіпергенных і гідратэрмальных працэсах) канцэнтрычнымі слаямі на сценках пустот ад іх перыферыі да цэнтра. Нярэдка ў сярэдзіне застаецца поласць, акаймаваная *друзамі* мінералаў. Адрозніваюць С. буйныя — жэоды і дробныя — міндаліны. Выкарыстоўваюцца ў ювелірнай справе, таксама як калекцыйны матэрыял.

САКС (Sachs) Ганс (5.11.1494, г. Нюрнберг, Германія — 19.1.1576), нямецкі паэт-майстэрзінгер, кампазітар. Вучыўся ў Нюрнбергскай лац. школе, шмат вандраваў. У 1554 заснаваў у Нюрнбергу школу *майстэрзінгераў*. Дэбютаваў алегарычным вершам у падтрымку М.Лютэра «Вітэнбергскі салавей» (1523). Аўтар больш як 6 тыс. рэліг. і свецкіх песень, гумарыст. і павучальных шпрухаў («Пра Юдзіф і Алаферна», 1533), шматлікіх *фастнахтшпіляў*, у т.л. «Шкаляр у раі» (1550), «Фюнзінгенскі канакрад» (1553), шванкаў («Святы Пётр з казой», «Святы Пётр і ландскнехты», абодва 1557), адметных сатырай, гумарам, сакавітай нар. мовай, гарэзлівым балаканнем і дыдактызмам. Вобраз С. паўстае ў оперы Р.Вагнера «Нюрнбергскія майстэрзінгеры» (1868).

Тв.: Рус. пер. — Избранное // Брант С. Корабль дураков; Сакс Г. Избранное. М., 1989.

Літ.: Пуришев Б.И. Ганс Сакс // История немецкой литературы. М., 1962. Т.1.

Г.В.Сініла.

САКС Уладзімір Мікалаевіч (22.4.1911, С.-Пецярбург — 17.12.1979), расійскі і бел. геолаг, геамарфолаг і палеантолаг. Чл.-кар. АН СССР (1958). Скончыў Ленінградскі горны ін-т (1933). У 1932—35 у Бел. геолагаразведачным трэсце (з 1933 Маскоўскі геолагаразведачны трэст), з 1935 у н.-д. установах па вывучэнні геалогіі Арктыкі, з 1958 у Сіб. аддзяленні АН СССР. Навук. працы па стратыграфіі чацвярцічных адкладаў Беларусі, палеагеаграфіі, стратыграфіі і тэктоніцы мезазойскіх адкладаў Арктыкі і Паўн. Сібіры. Распрацаваў падрабязную схему стратыграфічнага падзелу чацвярцічных адкладаў Беларусі і Арктыкі. Дзярж. прэмія СССР 1978.

Да арт. **Сакрэцыя** ў мінералогіі. Міндаліна, складзеная з агату.

Тв.: К вопросу о стратиграфии ледниковых отложений Белоруссии // Тр. комиссии по изучению четвертичного периода. 1934. Т. 4, вып. 1; Четвертичный период в Советской Арктике. 2 изд., Л.; М., 1953; Стратиграфия юрской и меловой систем Севера СССР. М.; Л., 1963 (у сааўт.).

П.К.**Саксаганскі**.

САКС (Sachs) Юліус (2.10.1832, г. Вроцлаў, Польшча — 29.5.1897), нямецкі батанік, адзін з заснавальнікаў эксперым. фізіялогіі раслін. Скончыў Пражскі ун-т. З 1861 праф. с.-г. акадэміі ў г. Попельсдорф з 1867 праф. Фрэйбургскага, з 1868 — Вюрцбургскага ун-таў (Германія). Навук. працы па пытаннях фотасінтэзу, формаўтварэння, росту і руху раслін, іх мінер. жыўленні і водным рэжыме, фізіял. паталогіі і гісторыі біялогіі. Высветліў, што крухмал утвараецца ў хларапластах у выніку засваення раслінамі вуглякіслага газу на сонечным святле, што хларапласты здольны самастойна рухацца, увёў паняцце пра «вял. перыяд росту». Склаў першую фізіял. класіфікацыю расл. тканак.

САКСАГА́НСКІ (сапр. Табілевіч) Панас Карпавіч (15.5.1859, с. Каменна-Каставатае Мікалаеўскай вобл., Украіна — 17.9.1940), украінскі акцёр і рэжысёр. Брат І.*Карпенкі-Карага*, М.*Садоўскага*. Нар. арт. СССР (1936). Прафес. акцёрскую дзейнасць пачаў у 1883 у трупе М.Старыцкага. У 1890—1909, 1915—17 арганізоўваў і ўзначальваў т-вы ўкр. акцёраў (з Садоўскім, М.Крапіўніцкім, М.Заньковецкай, Карпенкам-Карым, І.Мар'яненкам). У 1918 стварыў у Кіеве Нар. т-р, з якога ў 1922 арганізаваны Укр. драм. т-р імя Заньковецкай. Працаваў у ім (з перапынкамі) да 1932, а таксама ў т-ры імя І.Франко, у 1927—31 у Харкаўскім нар. т-ры. Тонкі знешні малюнак ролі, дасканалая прапрацоўка дэталей, багатая адценнямі сцэн. мова, нар. гумар — характэрныя рысы яго выканальніцкай дзейнасці. Сярод лепшых роляў: Возны («Наталка Палтаўка» І.Катлярэўскага), Карась («Запарожац за Дунаем» С.Гулак-Арцямоўскага), Банавентура, Гнат Голы, Тарабанаў («Сто тысяч», «Мартын Баруля», «Марнасць» Карпенкі-Карага), Галахвосты («За двума зайцамі» Старыцкага), Франц («Разбойнікі» Ф.Шылера). З 1889 працаваў як рэжысёр. Паставіў п'есы «Абяздоленая», «Марасць» Карпенкі-Карага (1890,

1904), «Па рэвізіі» Крапіўніцкага (1891), «Урыэль Акоста» К.Гуцкава (1918), «Атэла» У.Шэкспіра (1926).

Тв.: По шляху життя. [Харків], 1935; Думки про театр. Київ, 1955.

Літ.: Стеценко Л. Панас Саксаганський. Київ, 1959. *У.М.Стэльмах.*



Галінка **саксаула** чорнага.

САКСАЎЛ (Haloxylon), род кветкавых раслін сям. лебядовых. 10 відаў. Пашыраны ў паўпустынях і пустынях Азіі. Найб. вядомыя С.: белы (H. persicum), зайсанскі (H. ammodendron) і чорны (H. aphyllum).

Кусты ці невял. дрэвы (выш. 1,5—12 м) з магутнай каранёвай сістэмай, якая часам дасягае глыб. 11 м. Жывуць 30—60 гадоў. Галінаванне вілаватае, маладыя парасткі чляністы, ломкія. Лісце ў выглядзе дробных бескаляровых лускавінак або бугаркоў (фотасінтэз адбываецца ў зялёных галінах). Кветкі двухполыя, па 4 у пазухах лускападобных прыкветнікаў. Плод — арэшак. Выкарыстоўваюцца для замацавання пяскоў і азелянення гарадоў. Драўніна ідзе на паліва, пераш. Зімой зялёныя галінкі — корм вярблюдаў і авечак. Тэхн., дэкар., кармавыя расліны. *В.М.Прохараў.*

САКСАФО́Н (франц. saxophone ад прозвішча вынаходніка Sax + ...*фон*), духавы язычковы муз. інструмент. Вынайдзены бельг. майстрам А.Саксам. Металічная (латуневая або сярэбраная) парабалічная трубка з дзюбападобным мундштуком і адзінарнай трысцінкай, мае 18—21 адтуліну на ствале, якія закрываюцца пры дапамозе клапанаў. У сям'і С. 7 асн. разнавіднасцей, найб. пашыраны альт і тэнар. Мае моцны гук, непаўторнай выразнасці і прыгажосці тэмбр, вял. віртуоз. магчымасці. З сярэдзіны 19 ст. выкарыстоўваецца ў духавым, оперным, пазней у сімф. аркестрах, у камерных ансамблях; з 20 ст. — у джазе, эстр. і поп-музыцы. С. выкарыстоўвалі ў сваіх творах А.Глазуноў, С.Пракоф'еў, А.Хачатуран, Дз.Шастаковіч і інш. *Л.А.Шымановіч.*

САКСО́НІЯ (Sachsen), гістарычная вобласць у Германіі. Ядром С. была Майсенская марка (створана на землях, заваяваных герм. феадаламі ў *палабскіх славян* у 10 ст.), у 1089 яна перайшла да феад. роду Ветынаў, якія таксама набылі ў 1247—64 Цюрынгію і ў 1423 Саксен-Вітэнберг (усх. частка б. Саксонскага герцагства 9—12 ст. — племянной дзяржавы *саксаў*) разам з тытулам *курфюрстаў*. За ўладаннямі Ветынаў паступова замацавалася назва С. (спачатку — Верхняя С. ў адрозненне ад Ніжняй С. на ПнЗ Германіі — гіст. вобласці саксаў). У канцы 15—16 ст. С. — важны цэнтр горнай прам-сці, кнігадрукавання, культ. асяродак (у 1409 засн. ун-т у Лейпцыгу, у 1522 у Вітэнбергу); у С. знаходзіліся апорныя пункты *Рэфармацыі* і *Сялянскай вайны 1524—26*. У выніку *Трыццацігадовай вайны 1618—48* курфюрст С. паводле Вестфальскага міру 1648 замацаваў за сабой Верхнія і Ніжнія Лужыцы. У канцы 17—18 ст. С. адзін з найб. эканамічна развітых раёнаў Германіі (горная справа, тэкст. прам-сць; у 1710 пачата вытв-сць *майсенскага фарфору* — першага ў Еўропе, лейпцыгскія кірмашы мелі агульнагерм. значэнне). У 1697—1763 С. была ў асабістай уніі з Рэччу Паспалітай: саксонскія курфюрсты былі адначасова каралямі польскімі і вял. князямі літоўскімі (гл. *Аўгуст II, Аўгуст III*). С. была арэнай баявых дзеянняў у *Паўночную вайну 1700—21, Сямігадовую вайну 1756—63, напалеонаўскія войны*. З 1806 выступала на баку Францыі, чл. *Рэйнскага саюза 1806—13*, набыла статус каралеўства, сталіца — Дрэздэн. Саксонскі кароль Фрыдрых Аўгуст I стаў на чале *Варшаўскага герцагства*. Рашэннем *Венскага кангрэса 1814—15* каля палавіны тэр. С. (з Вітэнбергам) перададзена Прусіі (разам з інш. тэр. склала прускую правінцыю С. з цэнтрам у Магдэбургу). У 1831 у Саксонскім каралеўстве ўведзена памяркоўна-ліберальная канстытуцыя. Адзін з асяродкаў Рэвалюцыі 1848—49 у Германіі (гл. *Дрэздэнскае паўстанне 1849*). У *аўстра-прускай вайне 1866* на баку Аўстрыі, з 1871 каралеўства ў складзе Герм. імперыі. Пасля Лістападаўскай рэвалюцыі 1918 — рэспубліка, потым зямля ў *Веймарскай рэспубліцы*. З 1945 у сав. зоне акупацыі Германіі, з 1949 у складзе ГДР. Пасля аб'яднання Германіі ў 1990 — зямля Саксонія. Гл. таксама *Ніжняя Саксонія* і *Саксонія-Ангальт*.

САКСО́НІЯ (Sachsen), зямля (адм. адзінка) на У Германіі. Пл. 18,4 тыс. км². Нас. каля 4,7 млн. чал. (2000). Адм. ц. — г. *Дрэздэн*, найб. гарады *Лейпцыг*, Хемніц, Цвікаў, Гёрліц. Пераважаюць нізкагор'і (каля 400—500 м); на Пд на граніцы з Чэхіяй Рудныя горы (выш. да 1214 м), на Пн украіна Паўн.-Германскай нізіны. Клімат умераны, пераходны да кантынентальнага. Т-ры паветра ў студз. каля 0 °С, у ліп. каля 18 °С. Ападкаў за год ад 700—800 мм на Пн

Саксафон.



да 1000 мм у гарах. Лясы (хвоя, дуб, граб, бук) лепш захаваліся ў гарах. Эканоміка індустр.-агр. характару. Здабыча бурага вугалю каля Лейпцыга і Гёрліца, паблізу ЦЭС, прадпрыемствы па брыкетаванні вугалю, коксахіміі і хіміі. Развіты машынабудаванне (Дрэздэн, Лейпцыг, Хемніц), металургія і выраб трансп. сродкаў (Гёрліц і інш.), электратэхніка і



электроніка (Дрэздэн, Хемніц), тэкст., фарфаравая, паліграф. прам-сць. У Рудных гарах традыц. выраб цацак і муз. інструментаў. У раўнінных і нізінных раёнах, у далінах рэк пераважае вырошчванне пшаніцы, цукр. буракоў, агародніны. У даліне р. Эльба — вінаградарства. У горных раёнах пераважае жывёлагадоўля. Птушкагадоўля. Садоўніцтва. Транспарт чыг., аўтамаб., унутраны водны. Турызм (Рудныя горы, «Саксонская Швейцарыя», Дрэздэн, Лейпцыг і інш.).

Да 1945 частка гіст. вобласці *Саксонія*. У канцы 2-й сусв. вайны ў крас.—маі 1945 занята амер. (Заходняя С.), у маі — чэрв. 1945 і сав. (акрамя акругі Шварцэнберг) войскамі. Пасля вываду адсюль амер. акупац. войск (13.6—1.7.1945) уся тэр. сучаснай С. перайшла пад кантроль Сав. ваен. адміністрацыі ў Германіі і стала аднайм. зямлёй. З кастр. 1949



САКСО́НІЯ-А́НГАЛЬТ (Sachsen-Anhalt), зямля (адм. адзінка) на У Германіі. Пл. 20,4 тыс. км². Нас. каля 2,9 млн. чал. (2000). Адм. ц. — г. *Магдэбург*, найб. гарады *Гале*, Дэсаў, Вітэнберг. Пераважае нізінны і раўнінны рэльеф Паўн.-Германскай нізіны. На ПдЗ горы Гарц (выш. да 1141 м). Клімат умераны, пераходны да кантынентальнага. Т-ры паветра ў студз. каля 0 °С, у ліп. каля 18 °С. Ападкаў 700—800 мм за год. Захаваліся ўчасткі лясоў (хвоя, бук, дуб). Здабыча бурага вугалю, калійных солей, меднай руды, прыроднага газу. Гал. галіны прам-сці: электраэнергетыка (буйныя ЦЭС), хім. (Лейна, Бітэрфельд, Вольфен), машынабудаванне (Магдэбург, Гале), чорная металургія (у гарах Гарц), электратэхніка (Гале) і інш. У сельскай гаспадарцы пераважае вырошчванне збожжа, цукр. буракоў, бульбы, агародніны. Жывёлагадоўля. Птушкагадоўля. Садоўніцтва. Транспарт чыг., аўтамаб., унутраны водны, у т.л. Сярэднегерманскі канал. Турызм (асабліва ў гарах Гарц).

Да 1945 частка гіст. вобласці *Саксонія*. У канцы 2-й сусв. вайны занята амер. і брыт. (да 1.7.1945), потым сав. акупац. войскамі. У ліп. 1945 паводле рашэння Сав. ваен. адміністрацыі ў Германіі тут утворана прав. Саксонія (з 1946 наз. С.-А.). З кастр. 1949 зямля ў складзе Герм. Дэмакр. Рэспублікі (ГДР). У ліп. 1952 падзелена на акругі Магдэбург і Гале, частка тэр. далучана да акруг Лейпцыг і Котбус. З кастр. 1990 у складзе аб'яднанай Германіі (ФРГ), адна з яе новаўтвораных (усх.) зямель [увайшлі б. акругі ГДР Магдэбург, Гале (б.ч.), Котбус (частка)].

«САКСО́НСКАЕ ЗЯРЦА́ЛА», зборнік сярэдневяковага германскага права. Складзены ў 1221—25 ням. юрыстам Эйке фон Рэпкаў, запіс феад. звычаяў Усх. Саксоніі. Аднак у ім знайшлі адлюстраванне і агульныя для феад. Германіі саслоўныя парадкі, а таксама пачатак развіцця таварна-грашовых адносін. «С.з.» складаецца з 2 частак. Першая частка — земскае права (Landrecht), змяшчала асобныя палажэнні аб дзярж. пабудове Германіі (выбары імператара, падзел свецкай і духоўнай улады і г.д.), а таксама нормы цывільнага і крымін. права, суда і працэсу. Другая частка — ленное права (Lehnrecht), прысвечана васальным адносінам паміж феадаламі.

САКСО́НСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1073—75, паўстанне насельніцтва Саксоніі (вобласці *саксаў*) і Цюрынгіі супраць герм. кароля Генрыха IV. У паўстанні ўдзельнічалі сяляне на чале з мясц. знаццю. Выклікана незадаволенасцю захадамі Генрыха IV умацаваць каралеўскі *дамен* (будаўніцтва крэпасцей з размяшчэннем гарнізонаў; спагнанне аброку з сялян і прымушэнне іх будаваць крэпасці; адбіранне ў знаці зямель для каралеўскага дамена). Напачатку паўстанцы дамагліся поспеху: у жн. 1073 Генрых IV уцёк з абложанага Гарцбурга, крэпасці былі зруйнаваны. Але кароль атрымаў дапамогу ад феадалаў зах. і паўд. Германіі, гараджан Вормса. У вырашальны момант вярхі С.п. заключылі кампрамісны мір з каралём (лют. 1074), пакінутыя імі сяляне былі разбіты. Задушэнне паўстання садзейнічала працэсу паскарэння ўцягвання саксонскага сялянства ў феад. залежнасць.

САКСО́НСКАЯ ДЫНА́СТЫЯ, дынастыя германскіх каралёў (у 919—1024) і імператараў «Свяшчэннай Рымскай імперыі» (з 962). Заснавальнік — Генрых I [919—936; гл. ў арт. *Генрых*]; яго пераемнікі: *Атон I* [936—973], *Атон II* [983—983], *Атон III* [983—1002]. Са смерцю апошняга прамая галіна С.д. скончылася, каралём стаў прадстаўнік яе бакавой лініі баварскі герцаг Генрых [кароль Генрых II, 1002—24]. На змену С.д. прыйшла *Франконская дынастыя*.

Літ.: Колесницкий Н.Ф. Исследование по истории феодального государства в Германии (IX — первая половина XII в.). М., 1959; Жадько Е.Г. Сто великих династий. М., 2001. *Г.В.Прыбытка.*

САКСО́НСКІ ФАРФО́Р, гл. *Майсенскі фарфор*.

СА́КСЫ (Sachsen), група стараж.-германскіх плямён, якія аб'ядналіся ў 3—4 ст. у племянны саюз. У раннім сярэдневякоўі займалі тэр. на Пн Германіі — на У ад Рэйна і на З ад Эльбы; у сярэдзіне 5 — 1-й пал. 6 ст. частка С. перасялілася ў Брытанію (гл. *Англасаксонскае завяванне, Англасаксы*). Кантынентальныя С. ў 6—8 ст. падзяліліся на вестфалаў, остфалаў, ангарыяў (энграў) і нордальбінгаў. Сац. лад (асн. крыніца — Саксонская праўда, гл. *Варварскія праўды*) не зведаў уплыву ант. рабства, захоўваў архаічныя рысы, але характарызаваўся рэзкім расслаенне на эдэлінгаў (племянная знаць) і фрэлінгаў (ніжэйшы пласт). Каралеўская ўлада адсутнічала. У выніку саксонскіх войнаў (772—804) *Карла Вялікага* С. заваяваны франкамі і ўключаны ў склад *Франкскай дзяржавы*. Насуперак супраціўленню С. прымусова насаджаліся феад. адносіны. У 843 вобласць С. адышла да Усх.-Франкскага каралеўства, у канцы 9 ст. тут створана Саксонскае герцагства. С. склалі этнічную аснову т.зв. ніжніх саксонцаў (гл. *Ніжняя Саксонія, Саксонія*).

СА́КСЭ (Sakse) Ганна (16.1.1905, хутар Лаўзас Гулбенскага р-на, Латвія — 2.3.1981), латышская пісьменніца. Засл. дз. культуры Латвіі (1946). Нар. пісьменніца Латвіі (1965). Вучылася ў Латв. ун-це (Рыга, 1925—27). З 1934 у нелегальным Аб'яднанні рэв. пісьменнікаў, мастакоў і журналістаў. Друкавалася з 1927. Раман «Працоўнае племя» (1941) пра жыццё лат. вёскі з 1870-х г. да рэ-

валюцыі 1905—07. Раман «На гару» (кн. 1—2, 1948, Дзярж. прэмія СССР 1949) пра аднаўленне лат. вёскі пасля Вял. Айч. вайны і першыя крокі калектывізацыі, раман «Іскры сярод ночы» (ч. 1—2, 1951—57) пра жыццё інтэлігенцыі даваен. Латвіі. Аўтар зб-каў апавяданняў «Вяртанне да жыцця» (1945), «Рэзкі акорд» (1946), зб-каў казак «Каваль шчасця» (1960), «Кароль Пік» (1962), «Казкі пра кветкі» (1966), твораў для дзяцей, нарысаў. На бел. мову некат. творы С. пераклалі А.Васілевіч, У.Васілевіч, В.Рабкевіч.

Тв.: Koproti raksti. Sej. 1—6. Riga, 1962—65; Бел. пер. — у кн.: Латышскія апавяданні. Мн., 1956; У кн.: Сучасныя латышскія апавяданні. Мн., 1978; У кн. Песня Даўгавы. Мн., 1986; Рус. пер. — Трудовое племя. Искры в ночи. М., 1969; Искры в ночи. В гору. М., 1974; Сказки о цветах. 2 изд. Рига, 1979.

САКТАХА́Н, хрыбет у горным ланцугу Янкан — Тукурынгра — Сактахан —Джагды ў Амурскай вобл. Расіі, гл. ў арт. *Тукурынгра*.

Сакура.

СА́КУРА, японская дэкар. вішня сям. ружавых. Пашырана на Д.Усходзе, у Японіі і Кітаі. Больш за 500 сартоў, выведзеных пераважна на аснове дзікіх відаў вішні дробнапілаватай (Cerasus serrulata = Prunus serrulata) і каротказшчаціністай (C. subhirtella = P. subhirtella).

Кусты або дрэвы выш. 1—20 м. Крона рознай формы (калонападобная, ніцая, раскідзістая і інш.). Лісце падоўжана-ланцэтнае, вострапілаватае, вясной — пурпуровае, летам — зялёнае або аранжавае, восенню — жоўта- ці ярка-чырв., фіялетавае або карычневае. Кветкі белыя, ружовыя, часта махровыя, дыяметрам 3—5 см. Плод — касцянка, неядомы. Часам да С. адносяць усе вішні, якія маюць махровыя і ружовыя кветкі. *В.М.Прохараў.*

СА́ЛА ледзяное, скопішчы змёрзлых ледзяных іголак у выглядзе плям або тонкага слоя шаравата-свінцовага колеру на рэках і азёрах. Знешне нагадвае плямы тлушчу (адсюль назва). Узнікае перад ледаставам пры пераахалоджванні вады ніжэй за 0 °С. Гл. таксама *Лядовы рэжым*.

САЛАВА́Т ЮЛА́ЕЎ (16.6.1752, в. Цякеева, цяпер Салавацкага р-на, Башкортастан — 8.10.1800), башкірскі нац. герой, паплечнік Е.І.*Пугачова* ў час *сялянскай вайны 1773—75*, паэт-імправізатар. У кастр. 1773 мабілізаваны на барацьбу з Пугачовым, але каля г. Арэнбург перайшоў на яго бок на чале атрада башкіраў (2 тыс. чал.). Сабраў атрад у 10 тыс. чал., змагаўся пад Арэнбургам, Кунгурам, у 1774 заняў Краснаўфімск. Пугачоў надаў яму чын брыгадзіра. 5.12.1774 С.Ю. узяты ў палон, пасля пакарання бізунамі і клеймавання ў кастр. 1775 адпраўлены на вечную катаргу ў крэпасць Рогервік на Балтыйскім м. (цяпер г. Пальдыскі, Эстонія), дзе памёр. Вершы С.Ю. (ствараліся і перадаваліся ў вуснай форме) заклікалі народ да барацьбы з прыгнятальнікамі, апявалі прыгажосць роднага краю, каханне. У гонар С.Ю. названы г. Салават у Башкортастане, яго вобраз адлюстраваны ў творах л-ры і мастацтва.

Тв.: Рус. пер. — Стихи // Дружба народов. 1972. № 11.

Літ.: Наш Салават. Уфа, 1973.

САЛАВЕ́Й Алесь (сапр. Радзюк Альфрэд Васілевіч; 1.5.1922, в. Крысава Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. — 22.1.1978), бел. паэт, празаік, перакладчык. Вучыўся ў Мінскім пед. вучылішчы (1938—40). Працаваў у газ. «Чырвоная Лагойшчына». У Вял. Айч. вайну вярстальшчык «Менскай газэты», сакратар час. «Новы шлях» (Рыга). З 1944 за мяжой: у 1945—49 у г. Зальцбург (Аўстрыя), з 1949 у Аўстраліі, дзе працаваў на фабрыцы. Друкаваўся з 1937. Аўтар зб-каў паэзіі «Мае песні» (1944), «Сіла гневу» (1948), паэм «На хуткіх крыллях вольнага Пегаса» (1943), «Звіняць званы святой Сафіі» (1946), «Домік у Менску» (1948), «Сын» (1949), у якіх раскрываюцца тэмы радзімы, яе гісторыі і прыроды, жыцця народа, кахання. У некат. творах уплыў М.Багдановіча. Пісаў апавяданні, фельетоны, вершы для дзяцей, вянкі санетаў, трыялеты, санеты, актавы, рандо, александрыны і інш. цвёрдыя строфы. На бел. мову пераклаў паасобныя творы А.Міцкевіча, Р.М.Рыльке, Т.Шаўчэнкі і інш.

Тв.: Нятускная краса. Нью-Ёрк; Мельбурн, 1982; У кн.: Туга па Радзіме. Мн., 1992.

Літ.: Грамадчанка Т. «За любоў да цябе я пакутаваць мушу...»: Алесь Салавей, 1922—1978 // Вяртання маўклівая споведзь. Мн., 1994; Булгакаў В. Алесь Салавей і паэзія беларускай эміграцыі // Крыніца. 1997. № 6; Кадняк З. Успаміны пра Алеся Салаўя // Беларуская мемуарыстыка на эміграцыі. Нью-Ёрк, 1999. *Л.С.Савік.*

САЛАВЕ́Й Аляксандр Раманавіч (1897, г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл. — 15.8.1920), удзельнік барацьбы за сав. ўладу ў Беларусі, герой грамадз. вайны. У 1-ю сусв. вайну на Зах. фронце (адзначаны георгіеўскім крыжам). У 1917 вярнуўся на радзіму і ўзначальваў Рудабельскі валасны рэўком, штаб па фарміраванні Чырв. гвардыі, змагаўся супраць легіянераў корпуса Ю.Р.Доўбар-Мусніцкага. У час ням. акупацыі 1918 узначальваў партыз. атрады на тэр. *Рудабельскай «рэспублікі»* і падп. падраённы к-т РКП(б). Удзельнік вызвалення Бабруйска ад ням. акупантаў, разгрому *стракапытаўскага паўстання 1919* у Гомелі і эсэраўскага мяцяжу ў Чарнігаўскай губ. Летам 1919 на чале Бабруйскага інтэрнац. батальёна, потым Барысаўскага палка змагаўся з польск. інтэрвентамі, абараняў Мінск. У вер.—снеж. 1919 на чале спец. атрада ўдзельнічаў у рэйдзе па тылах латышскай арміі ад Пскова да Асвеі. Са снеж. 1919 камандзір 1-га інтэрнац. батальёна палка чырв. камунараў, удзельнік вызвалення Асвеі, баёў за Рэжыцу, Полацк, Барысаў, Лепель. З лета 1920 у корпусе Г.Дз.Гая, удзельнічаў у вызваленні Вільні, Гродна. Загінуў у баі каля мяст. Кольна (Польшча).

Літ.: Грахоўскі С. Рудабельская рэспубліка. Мн., 1968. *І.П.Хаўратовіч.*

САЛАВЕ́Й Іван Мікалаевіч (6.8.1916, в. Хатляны Уздзенскага р-на Мінскай вобл. — 5.3.1987), бел. вучоны ў галіне глебазнаўства. Канд. с.-г. н. (1955). Скончыў БДУ (1940). З 1947 у БелНДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі. У 1957—82 у Бел. НДІ глебазнаўства і агрохіміі. Навук. працы па генезісе глеб, іх картаграфіі, класіфікацыі, методыцы даследавання. Удзельнічаў у складанні глебавай карты Беларусі. Дзярж. прэмія Беларусі 1976.

Тв.: Методические указания по почвенно-геоботаническим и агрохимическим крупномасштабным исследованиям в БССР. Мн., 1973 (у сааўт.); Почвы Белорусской ССР. Мн., 1974 (у сааўт.).

САЛАВЕ́Й Ларыса Фёдараўна (н. 22.7.1934, г. Орша Віцебскай вобл.), бел. мастацтвазнавец. Засл. настаўнік Беларусі (1975). Скончыла Бел. тэатр.-

Форма кроны **сакуры**: 1 — калонападобная; 2 — ніцая; 3 — лейкападобная.

маст. ін-т (1968). У 1966—81 выкладала ў ПТВ, у 1968—70 —у Бел. тэатр.-маст. ін-це, у 1988—92 нам. дырэктара Дырэкцыі маст. выставак Мін-ва культуры Беларусі, у 1992—97 — выставачнага комплексу «На ростанях». Даследуе мастацтва сучаснае і 1930-х г., праблемы эстэт. выхавання, музеязнаўства. Аўтар творчых партрэтаў пра Г.Вашчанку, А.Гугеля, Я.Зайцава, А.Казлоўскага, У.Кожуха, П.Крахалёва, А.Кузьміча, І.Міско Л.Панамарэнку, Я.Радзялоўскую, Р.Сіплевіч, В.Целеша і інш.; арганізатар выставак бел. мастакоў у Італіі і Славакіі, складальнік каталогаў.

Тв.: Р.У.Кудрэвіч. Мн., 1974; Мікалай Казакевіч. Мн., 1986; Іван Рэй: Альбом. Мн., 1990. *Б.А.Крэпак.*

САЛАВЕ́Й Леў Антонавіч (21.10.1925, Мінск — 3.1.1988), бел. перакладчык. Скончыў БДУ (1950). З 1950 працаваў у Бел. дзярж. выд-ве (пасля выд-ва «Беларусь»), з 1972 у выд-ве «Мастацкая літаратура». Друкаваўся з 1950. На рус. мову перакладаў творы М.Гарэцкага, У.Дамашэвіча, М.Зарэцкага, П.Кавалёва, В.Каваля, А.Марціновіча, Р.Мурашкі, І.Навуменкі, Р.Няхая, М.Ткачова і інш.; на бел. мову пераклаў «Зламаную падкову» А.Кешокава, «Выбранае» А.Купрына, «Святло ў Каордзі» Г.Леберэхта, «Вадзіцеляў» А.Рыбакова, «Выбраныя творы» М.Садавяну, «Белы шалаш» М.Шундзіка і інш., паасобныя творы Ч.Айтматава, А.Вішні, А.Ганчара, Я.Гуцалы, Ф.Дастаеўскага, А.Даўжэнкі, Л.Талстога, М.Шолахава, В.Шышкова і г.д. Пісаў рэцэнзіі, крыт. артыкулы.

САЛАВЕ́Й Лія Мацвееўна (н. 1.9.1934, в. Навасёлкі Мядзельскага р-на Мінскай вобл.), бел. фалькларыстка. Канд. філал. н. (1974). Скончыла Мінскі пед. ін-т (1960). У 1970—94 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. Даследуе актуальныя праблемы бел. фалькларыстыкі, творчыя ўзаемасувязі нар. вусна-паэт. творчасці слав. народаў. Аўтар манаграфіі «Беларуская народная балада» (1978). Сааўтар манаграфіі «Узроўні агульнасці фальклору ўсходніх славян», слоўніка «Усходнеславянскі фальклор» (абодва 1993). Складальніца тамоў «Балады» (кн. 1—2, 1977—78), «Веснавыя песні» (1979), «Валачобныя песні» (1980), «Жаніцьба Цярэшкі» (1993) са збору *«Беларуская народная творчасць»* (Дзярж. прэмія Беларусі 1986). *І.У.Саламевіч.*

Л.М.**Салавей**.

САЛАВЕ́Й-РАЗБО́ЙНІК, персанаж былін і чарадзейных казак; пачварны змей, які сваім свістам губіў падарожных на шляху да Кіева. Перамог яго Ілья Мурамец. Паводле некат. былін, дарога, дзе жыў С.-р., праходзіла праз бранскія лясы і «грязі смаленскія». У стараж. Беларусі, калі меркаваць па пісьме 1574 аршанскага старосты Ф.Кміты-Чарнабыльскага, С.-р. наз. Будзімеравым сынам. Так ён названы і ў рукапіснай «Аповесці пра слаўнага асілка Ілью Мурамца» 18 ст. Нярэдка ў бел. казках пра Ілью Мурамца замест С.-р. выступае Змей (Цмок).

САЛАВЕ́ЦКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1668—76, Салавецкае сядзенне, народнае паўстанне ў *Салавецкім манастыры* супраць царк. рэформы патрыярха *Нікана*, за аднаўленне «старой веры» (гл. *Раскол*). Удзельнікі (450—500 чал.): манахі, паслушнікі, манастырскія работнікі і сяляне, збеглыя стральцы і салдаты; у 1670-я г. да іх далучыліся многія б. паплечнікі С.Ц.*Разіна*. У 1667 манахі не прынялі папраўленыя паводле рэформы богаслужэбныя кнігі. Адкрытае паўстанне пачалося 2.7.1668, калі спроба маскоўскіх стральцоў заняць манастыр сустрэла ўзбр. супраціўленне. Паступова кіраўніцтва паўстаннем перайшло ад вярхоў манаства («старцаў») да прадстаўнікоў сац. нізоў (сялян і б. разінцаў), якія на першы план высоўвалі патрабаванне адмены прыгонніцкіх парадкаў. Дзякуючы харч. дапамозе навакольных сялян паўстанцы ва ўмацаваннях манастыра больш як 7 гадоў вытрымлівалі аблогу ўрадавых войск. У студз. 1676 у выніку здрады манастыр быў узяты і паўстанне задушана, амаль усе ўдзельнікі забіты або пазней пакараны смерцю.

Літ.: Барсуков Н.А. Соловецкое восстание (1668—1676 гг.). Петрозаводск, 1954; Чумичева О.В. Страницы истории Соловецкого восстания (1666—1676 гг.) // История СССР. 1990. № 1.

САЛАВЕ́ЦКІ МАНАСТЫ́Р. На Салавецкіх а-вах у Белым м. ў Архангельскай вобл. Расіі. Засн. ў 1429—36 манахамі Германам і Саваціем. З 15—16 ст. меў вял. зямельныя ўладанні па берагах Белага м., вёў развітую сельскую гаспадарку, саляны, рыбалавецкі, зверабойны, жалезны і інш. промыслы. Неаднаразова адбіваў напады шведаў (1571, 1582, 1611), у 1613 манастырскі атрад выцесніў з Карэліі войскі Рэчы Паспалітай і б. прыхільнікаў *Ілжэдзмітрыя II*. У сувязі з непрызнаннем манахамі царк. рэформы патрыярха *Нікана* адбылося *Салавецкае паўстанне 1668—76*. З 1765 сінаўрапігіяльны, г.зн. непасрэдна падначалены Сіноду манастыр. У *Крымскую вайну 1853—56* С.м. летам 1854 вытрымаў абстрэл брыт. эскадры. З 16 ст. выкарыстоўваўся як месца зняволення. Сярод вязняў былі пісьменнікі-публіцысты *Максім Грэк* і Аўрамій Паліцын, касімаўскі царэвіч Сімяон Бекбулатавіч, дыпламат П.А.*Талстой* і інш. У 1903 салавецкая турма скасавана, у 1920 адноўлена. У 1923 манастыр скасаваны, у 1923—37 на яго тэр. існавалі Салавецкія лагеры асобага прызначэння, у 1937—39 — Салавецкая турма асобага прызначэння. Сярод вязняў сав. часу бел. пісьменнік Ф.*Аляхновіч*, рус. філосаф П.А.*Фларэнскі*, даследчык стараж. рус. л-ры Дз.С.*Ліхачоў* і інш. У 1942—45 тут размяшчалася Школа юнгаў Паўн. флоту. З 1974 на астравах дзейнічае Салавецкі дзярж. гіст.-арх. і прыродны музей-запаведнік. У 1991 манастыр вернуты царкве.

Тэр. С.м. абкружана магутнымі сценамі (выш. 8—11 м, таўшчыня 4—6 м) з 7 варотамі і 8 вежамі (1584—94, майстар Трыфан), складзенымі пераважна з вял. неапрацаваных камянёў-валуноў. Больш за 100 гадоў пабудовы манастыра былі драўляныя, у 1485 і 1538 знішчаны пажарам. Пры перабудове каменныя храмы захавалі рысы папярэдніх драўляных. Ініцыятар перабудовы ігумен П.Колычаў для ўзвядзення манум. храмаў прывёз у 1552 майстроў Салку і Сталыпу. Будынкі комплексу пастаўлены на адной восі, злучаны крытымі арачнымі пераходамі і абкружаны шматлікімі гасп. і жылымі пабудовамі. Сярод помнікаў: Успенскі сабор (1552—57), з трапезнай (1-стаўповая палата пл. 500 м^2), Спаса-Праабражэнскі сабор (1558—66, 3-ярусны, з выразнай піраміда́льнасцю асн. аб'ёму і 4 вежападобнымі прыдзеламі па вуглах), царква Дабравешчання (1596—1601), іканапісная палата (1615), вадзяны млын (пач. 17 ст.), званіца (1777), цэрквы Філіпаўская (1797—98, перабудавана ў 19 ст.) і Мікалая (1834), Троіцкі сабор (1856—59). У 1930-я г. комплекс пашкоджаны, цяпер у стане рэстаўрацыі. С.м. уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.



Салавецкі манастыр.

Літ.: Фруменков Г.Г. Соловецкий монастырь и оборона Беломорья в XVI—XIX вв. Архангельск, 1975; Скопин В.В. На Соловецких островах. М., 1990; Солженицын А.И. Архипелаг ГУЛАГ. М.; Мн., 1990. Т. 2. С. 28—68; Архитектурно-художественные памятники Соловецких островов. М., 1980; Скопин В.В., Щенникова Л.А. Архитектурно-художественный ансамбль Соловецкого монастыря. М., 1982.

Г.В.Прыбытка (гісторыя), *Г.А.Лаўрэцкі* (архітэктура).

А.Ф.Салагуб.

САЛАВЕ́ЦКІЯ АСТРАВЫ́, група астравоў у Белым м., пры ўваходзе ў Анежскую губу, у Архангельскай вобл. Расіі. Пл. 347 км^2. Складзены з 6 а-воў: Салавецкі, Анзерскі, Вял. і Мал. Муксалма, Вял. і Мал. Заяцкія. Берагавыя лініі моцна зрэзаныя. Складзены з гранітаў, гнейсаў. Рэльеф узгорысты, выш. да 107 м (г. Галгофа на в-ве Анзерскі). Каля 500 азёр, частка якіх злучана каналамі. Хваёвыя лясы, часткова забалочаныя. На Салавецкім в-ве размешчаны ансамбль *Салавецкага манастыра* (засн. ў 15 ст.). Каля яго, а таксама на інш. астравах размешчаны былыя скіты, культавыя, жылыя і гасп. пабудовы 16—19 ст. У 1923—39 на С.а. размяшчаліся Салавецкія лагеры асобага прызначэння (у 1937 перайменаваны ў Салавецкую турму асобага прызначэння). Гіст.-культ. і прыродны ансамбль С.а. уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*. Турызм.

САЛАГУ́Б Алесь Феафілавіч (18.10.1906, в. Зарудзічы Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. — 17.5.1934), бел. паэт, літаратуразнавец, публіцыст. Скончыў Віленскую бел. гімназію (1927), БДУ (1931). У Зах. Беларусі далучыўся да дзейнасці Бел. сялянска-работніцкай грамады. Быў вязнем (1924, 1927) віленскіх астрогаў. У 1928 нелегальна перайшоў польска-сав. мяжу, жыў у Мінску. У 1933 рэпрэсіраваны, у 1934 прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1956. Друкаваўся з 1924 у газ. «Жыццё беларуса», «Наша праўда», час. «Маланка» (падпісваўся часта Лявон Чачотка), у газ. «Звязда», «Літаратура і мастацтва», час. «Полымя рэвалюцыі» і інш. У Мінску выдаў зб. вершаў «Лукішкі» (1929). Асн. тэмы яго творчасці — барацьба за сац. і нац. вызваленне, гал. герой — вязень-рэвалюцыянер. У літ.-знаўчых («Паэзія рэвалюцыйнага падполля Заходняй Беларусі», 1931; «Мастацкая літаратура «Грамады», 1933) і публіцыст. працах (некат. з В. Таўлаем) спрабаваў вызначыць кірункі развіцця л-ры Зах. Беларусі, дапускаў сацыялаг. ацэнкі. Збіраў фальклор, нар. лексіку, выкарыстоўваў іх у сваіх творах. Яго «Лукішскі дзённік» часткова апубл. ў 1961.

Тв.: У кн.: Сцягі і паходні. Мн., 1965.

Літ.: Калеснік У. Алесь Салагуб // Калеснік У. Лёсам пазнанае. Мн., 1982; Ліс А. Цяжкая дарога свабоды. Мн., 1994. *А.С.Ліс.*

САЛАГУ́Б Аляксандр Міхайлавіч (н. 2.12.1935, в. Смелае Сумскай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне машынабудавання. Д-р тэхн. н. (1991), праф. (1999). Засл. вынаходнік Беларусі (1990). Скончыў Маскоўскі тарфяны ін-т (1962). З 1965 у НВА «Дармаш» (з 1972 — дырэктар), з 1979 нам. ген. дырэктара, з 1991 ген. дырэктар НВА «Дарбудтэхніка». З 1998 у БПА. Навук. працы па канструяванні колавых і гусенічных машын з тэхнал. комплексамі для механізацыі будаўнічых і дарожных работ, тэхналогіі, эканоміцы і арганізацыі машынабудавання.

Тв.: Механизация работ при строительстве и эксплуатации дорог. Мн., 1989 (разам з Я.С.Цэдрыкам і У.П.Лысаконем); Унификация и агрегатирование в проектировании тракторов и технологических комплексов. Мн., 2000 (у сааўт).

САЛАГУ́Б Васіль Усцінавіч (4.9.1848 — пасля жн. 1907), расійскі ваен. і дзярж. дзеяч. Ардынарны праф. Мікалаеўскай акадэміі Генштаба (1895). Ген.-лейт. (1897). З дваран Мінскай губ. Скончыў 2-е Канстанцінаўскае ваен. вучылішча (1866), Мікалаеўскую акадэмію Генштаба (1875 ?). Удзельнік рус.-тур. вайны 1877—78. У 1880 і 1882 прымаў удзел у міжнар. камісіі па размеркаванні тэр. Чарнагорыі; вырашэнні грэка-тур. пытання; знаходзіўся пры англ. экспедыцыйным корпусе ў Егіпце, дзе часова кіраваў рас. ген. консульствам. У 1884—90 нач. 2-га аддзялення Гал. штаба, з крас. 1890 прымаў удзел у рабоце камісій па ўзвядзенні абарончых збудаванняў на зах. мяжы Рас. імперыі і ўзбраенні крэпасцей. У ліп. — вер. 1893 камандзір брыгады ў Віленскай ваен. акрузе. З 1896 у Гал. штабе і ў ваен. міністэрстве. Чл. праўлення Кітайскай Чанчуньскай чыгункі (з 1900 і з 1906). У снеж. 1905 — кастр. 1906 — часовы Прыбалтыйскі ген.-губернатар.

А.М.Лукашэвіч.

САЛАГУ́Б Мікалай Уладзіміравіч (4.5.1883, Мінская губ. — 7.8.1937), удзельнік грамадз. вайны на Беларусі, камдыў (1935). Скончыў Паўлаўскае ваен. вучылішча (1902), Акадэмію Генштаба (1910), Ваенна-паліт. курсы (1925). З 1910 у штабах Віленскай ваен. акругі, 1-й арміі. Удзельнік 1-й сусв. вайны. З 1918 у Чырв. Арміі, нач. штаба Усх. фронту, чл. Вышэйшай інспекцыі РСЧА, нач. аператыўнага ўпраўлення штаба Зах. фронту. Са жн. 1919 камандуючы 16-й арміяй, удзельнік *Варшаўскай аперацыі 1920*, камандуючы Зах. фронтам. З кастр. 1920 нач. штаба Зах., потым Паўд. франтоў, Узбр. сіл Украіны і Крыма, нач. Акадэміі паветр. флоту, потым у ваен. навуч. установах РСЧА. У чэрв. 1937 пасля «раскрыцця фашысцкай змовы ў РСЧА» С. органамі НКУС СССР быў ахарактарызаваны як «па-антысавецку настроены элемент, цесна звязаны з выкрытымі ворагамі народа».

САЛАГУ́Б Уладзімір Аляксандравіч (20.8.1813, С.-Пецярбург — 17.6.1882), рускі пісьменнік; граф. Скончыў Дэрпцкі (Тартускі) ун-т (1834). У 1835—42 служыў чыноўнікам пры Мін-ве ўнутр. спраў у Смаленску, Віцебску, Цверы. Друкаваўся з 1837. Аповесць «Тарантас» (1845) з трапнымі замалёўкамі правінцыяльнага побыту. У аповесцях «Вялікі свет» (1840), «Мядзведзь» (1843) і інш. іронія над арыстакратычным светам. Аповесць «Аптэкарка» (1841), «Няскончаныя аповесці» (1843) пра студэнцкае жыццё. Аўтар аўтабіягр. рамана «Цераз край» (апубл. 1885), зб. «Трыццаць чатыры альбомныя вершы» (1855), паэмы «Нігіліст» (1866), вадэвіляў «Ямшчык, ці Свавольства гусарскага афіцэра» (паст. 1842), «Бяда ад пяшчотнага сэрца» (паст. 1850), «Майстэрня рускага жывапісца», «Ноч перад вяселлем, ці Грузія праз сто гадоў» (абодва паст. 1854), камедыі «Чыноўнік» (1856), «Успамінаў» (1865) пра А.Пушкіна, М.Гогаля, М.Лермантава і інш.

Тв.: Избр. проза. М., 1983; Повести. Воспоминания. Л., 1988; Петербургские страницы воспоминаний графа Соллогуба: С портретами его современников. СПб., 1993.

Літ.: Грехнев В.А. Творчество В.А. Соллогуба в русской прозе конца 30-х — 1 половины XIX в. Горький, 1967.

САЛАГУ́Б (сапр. Цяцернікаў) Фёдар Кузьміч (1.3.1863, С.-Пецярбург — 5.12.1927), рускі пісьменнік. Скончыў С.-Пецярбургскі настаўніцкі ін-т (1882).

Да 1907 настаўнічаў. Друкаваўся з 1884. Адзін з тэарэтыкаў *сімвалізму* (арт. «Дэманы паэтаў», 1907; «Тэатр адной волі», 1908, і інш.). У першым рамане «Цяжкія сны» (1895) спалучэнне натуралістычнага паказу правінцыяльнага побыту з пропаведдзю эстэтызму і эротыкі. Матывы адчаю, індывідуалізм у паэт. зб. «Палымяны круг» (1908). Гратэскны паказ жыцця рус. правінцыі ў зб. апавяданняў «Джала смерці» (1904), рамане «Дробны чорт» (1905) і інш. У трылогіі «Легенда, якая ствараецца» (ч. 1—3, 1907—13) — культ і трагізм эрасу. Сімвалічныя тэмы і матывы ў паэт. зб-ках «Блакітнае неба» (1920), «Фіміямы» (1921), «Жалейка» (1922) і інш. Аўтар «Палітычных казачак» (1906), зб. паліт. вершаў «Радзіме» (1906), п'ес «Дар мудрых пчол» (1907), «Перамога смерці» (паст. 1907), «Начныя скокі» (1908), рамана «Заклінальніца змеяў» (1921) і інш. Перакладаў Вальтэра, Гі дэ Мапасана, Ш.Бадлера, П.Верлена, А.Рэмбо, Г.Гейнэ, О.Уайльда, Т.Шаўчэнку і інш.

Тв.: Свет и тени: Избр. проза. Мн., 1988; Голодный блеск: Избр. проза. Киев, 1991; Творимая легенда. М., 1991; Неизданный Федор Сологуб. М., 1997; Лирика. Мн., 1999.

САЛАГУ́БЫ, Давойна-Салагубы, шляхецкі род герба «Праўдзіц» у ВКЛ. Родапачынальнік Андрэй жыў у 2-й пал. 15 ст. З 17 ст. ўжывалі прыдомак Давойна, з 18 ст. карысталіся графскім тытулам. Найб. вядомыя:

Юрый Андрэевіч (?—1514), намеснік смаленскі ў 1503—07. Ян Міхал (? — 5.5.1748), сын Гераніма, чашнік жамойцкі ў 1713, падкаморы гастынскі ў 1722—24, лоўчы ВКЛ у 1724—31, вял. падскарбі ВКЛ у 1731—46, ваявода брэсцкі з 1746; брыгадзір войска ВКЛ (1724), маршалак Трыбунала ВКЛ у 1729 і 1747, староста рэчыцкі, езярышчанскі, стралецкі і санніцкі. Валодаў Горы-Горкамі, Чарэяй, Туравам. Юзаф Антоній (26.7.1709—81), сын Яна Міхала, кашталян жамойцкі ў 1742—48 і віцебскі ў 1748—52, ваявода віцебскі з 1752; палкоўнік, староста эйшышкскі і санніцкі. Ён і брат тытулаваліся графамі на Ілы, Івянцы, Тураве і Горы-Горках. Антоній (? — вер. 1759), сын Яна Міхала, палкоўнік, генерал артылерыі ВКЛ з 1746; староста езярышчанскі. Ян (? — 1812), сын Антонія, маёр артылерыі, з 1774 генерал-ад'ютант караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. З'ехаў у Расію, палкоўнік рас. арміі, камандзір Славянскага гусарскага палка з 1777, Бел. гусарскага палка з 1779, ген.-маёр (1785); у 1794—98 шлісельбургскі павятовы прадвадзіцель дваранства. Яго нашчадкі (у т.л. ўнук — рус. пісьменнік У.А. *Салагуб*) атрымалі ў Расіі 11.3.1861 пацвярджэнне традыцыйна ўжыванага графскага тытула.

У.М.Вяроўкін-Шэлюта.

САЛАДЗІ́ЛЬНЯ, саладоўня, старадаўняе гаспадарчае збудаванне, дзе прарошчвалі і сушылі зерне на солад; тып *сушні*. Вядома ў матэрыяльнай культуры многіх слав. народаў. На Беларусі ў 16—19 ст. будавалі (пераважна пры броварах ці асобна) драўляныя пабудовы, накрытыя драніцамі ці саломай, з маленькімі вокнамі. Складалася з 2 памяшканняў: у адным ставілі рошчыну, у другім была сушня з курнай печчу. С. былі ў многіх маёнтках і сядзібах. Часам іх выкарыстоўвалі як сушні. *Ю.А.Якімовіч.*

САЛАДЗІ́Н, гл. *Салах-ад-дзін*.

САЛАДКО́Ў Аляксандр Пятровіч (н. 5.10.1960, г. Віцебск), бел вучоны ў галіне фізіялогіі. Д-р мед. н. (1998). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1984), працуе ў ім (з 1999 заг. лабараторыі). Навук. працы па фізіялогіі і паталогіі мясц. механізмаў рэгуляцыі сасудзістага тонусу, прафілактыцы стрэсарных змен нармальных і пашкоджаных сасудаў і сэрца.

Тв.: К механизму влияния малых доз тиреоидных гормонов на стрессорные изменения тонуса сосудов крыс (разам з А.П.Бажко) // Физиол. журн. 1995. Т. 81, № 12; К механизму стрессорного угнетения сократительной функции и реактивности гладкой мышцы аорты (з ім жа) // Там жа. 1996. Т. 82, № 7.

САЛАДКО́Ў Іосіф Іванавіч (12.7.1906, в. Падбеляе Магілёўскага р-на — 18.10.1996), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1959), праф. (1962). Скончыў Камуніст. ін-т журналістыкі ў Мінску (1933), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК ВКП(б) (1950). З 1927 на камсамольскай рабоце. У 1938—41 выкладчык Мінскага мед. ін-та. З 1946 рэдактар час. «Бальшавік Беларусі». У 1950—63 выкладчык, заг. кафедры БДУ, у Ін-це гісторыі АН БССР. Рэктар Петразаводскага ун-та (1956—57). З 1964 на выкладчыцкай рабоце ў Бел. політэхн. ін-це. Аўтар прац па гісторыі Касгр. рэвалюцыі і ўстанаўлення Сав. улады на Беларусі.

Тв.: Социально-экономическое положение Белоруссии до Великой Октябрьской социалистической революции (конец XIX — начало XX в.). Мн., 1957; Большевики Белоруссии в период подготовки и проведения Великой Октябрьской социалистической революции (март 1917 — февраль 1918). Мн., 1957.

САЛАДКО́Ў Цімафей Ерафеевіч (21.2.1915, в. Шчэжар Магілёўскага р-на — 23.11.1995), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1965), праф. (1966). Скончыў Смаленскі пед. ін-т (1950). З 1946 на парт. рабоце ў Смаленскай вобл. З 1952 у Ін-це гісторыі партыі пры ЦК КПБ, у БДУ. З 1964 заг. кафедры і адначасова (1965—71) прарэктар Мінскага радыётэхн. ін-та. Даследаваў гісторыю рэв. руху на Беларусі напярэдадні і ў перыяд 1-й сусв. вайны, Лют. рэвалюцыі 1917. Адзін з аўтараў «Нарысаў гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі» (ч. 1, 2-е выд. 1968).

Тв.: Бальшавікі Беларусі ў перыяд першай сусветнай вайны і другой рускай рэвалюцыі (1914 — сакавік 1917 гг.). Мн., 1957; Борьба трудящихся Белоруссии против царизма (1907—1917 гг.). Мн., 1967; Большевистская газета «Правда» в Белоруссии (1912—1917 гг.). 2 изд. Мн., 1972; Полувековой опыт СССР и современный мир. Мн., 1975.

Э.А.Забродскі.

САЛАДО́ЎНЯ, тое, што *саладзільня*.

САЛАДУ́ХА, у беларусаў кісла-салодкая мучная страва. Наз. таксама путра. Жыта замочвалі на суткі, потым сушылі і малолі ў жорнах; разводзілі вадой у гаршку, прыварвалі і вылівалі ў дзежку закісаць. Як укісне, елі з бульбай. Часцей С. рабілі з жытняй нясоладавай мукі. Тады яе даўжэй парылі, каб лепш усаладжала, або дадавалі мёд, цукар. С. разводзілі таксама з грэцкай або з сумесі жытняй (2 часткі) і грэцкай (1 частка) мукі. З С. рабілі квас, на ёй некат. рашчынялі хлеб. На Мядзельшчыне, Пастаўшчыне С. наз. ўсаладжалую закалоту з жытняй мукі, з якой разводзілі *раўгеню*.

Г.Ф.Вештарт.

САЛАДУ́ХА Аляксандр Антонавіч (н. 18.1.1959, с. Каменка Сергіева-Пасадскага р-на Маскоўскай вобл.), бел. эстрадны спявак. Скончыў Мінскі мед. ін-т (1982). Працаваў урачом (1982). З 1987 саліст Дзярж. аркестра сімф. і эстр. музыкі Беларусі, з 1989 — т-ра песні Я.Паплаўскай і А.Ціхановіча. З 1991 працуе са створанай ім групай «Карусель». Валодае голасам прыгожага тэмбру; яго выкананне вылучаецца шчырасцю і эмац. выразнасцю. У творчасці пераважае стрыманы рас.-бел. шансон з бардаўскім ухілам. У рэпертуары песні бел. і рас. кампазітараў, у т.л. Э.Ханка, А.Марозава, А.Елісеенкава, І.Каплянава, С.Сухамліна. Дыпламант Міжнар. фестывалю «Шлягер-90» (1990, Ленінград).

САЛАЗА́Р (Salazar) Антоніу ды Аліверйра (de Oliveira; 28.4.1889, г. Санта-Комба-Дан, Партугалія — 27.7.1970), партугальскі паліт. і дзярж. дзеяч, эканаміст. Скончыў Каімбрскі ун-т (1916), у 1916—28 праф. паліт. эканоміі гэтага ун-та. Адзін з заснавальнікаў партыі Каталіцкі цэнтр (1918). З 1921 дэп. парламента. У 1928—40 міністр фінансаў. У 1932—68 прэм'ер-міністр (фактычна дыктатар) Партугаліі, адначасова ваен. міністр (1936—44) і міністр замежных спраў (1936—47). Абапіраючыся на засн. ім у 1930 партыю Нац. саюз, устанавіў у краіне унітарна-карпаратыўную дзяржаву (юрыд. афармлена паводле канстытуцыі 1933). У 2-ю сусв. вайну захоўваў нейтралітэт Партугаліі. Пасля 1945 імкнуўся да супрацоўніцтва з зах. дзяржавамі, асабліва ў ваен.-паліт. галіне (у 1949 Партугалія ўступіла ў НАТО). З пач. 1960-х г. вёў калан. вайну супраць нац.-вызв. руху ў Анголе, Гвінеі-Бісау і Мазамбіку. У 1968 адышоў ад дзярж. спраў.

САЛАЇ́РСКІ КРАЖ, платопадобнае ўзвышша на ПдЗ Сібіры, у Кемераўскай і Новасібірскай абл. і Алтайскім краі Расіі. Абмяжоўвае з ПдЗ Кузнецкую катлавіну. Даўж. каля 300 км, выш. 621 м (г. Кіўда). Складзены з крышт. вапнякоў, пясчанікаў, туфаў, гранітаў. Радовішчы поліметалічных руд. На пакатых паўд.-зах. схілах і выраўнаваных паверхнях вяршынь — асінава-піхтавыя і бярозава-асінавыя высакатраўныя лясы. На стромкіх паўн.-ўсх. схілах — бярозава-асінавыя, лістоўнічныя і хваёвыя лясы з участкамі стэпаў.

Салака.

САЛА́КА, селядзец балтыйскі (Clupea harengus membras), рыба сям. селядцовых, падвід селядца атлантычнага. Пашырана ў Балтыйскім м., асабліва ва ўсх. яго частцы і ў некат. прэснаводных азёрах Швецыі. Пелагічная чародная рыба. Утварае 2 экалагічныя групы: адны С. нерастуюць вясною, другія — увосень.

Даўж. да 20 см, маса да 75 г. Хуткаслая форма — С. гіганцкая (стрэмлінг) дасягае даўж. 38 см, з'яўляецца драпежнікам. С. корміцца планктоннымі ракападобнымі. Асн. прамысл. рыба Балт. мора.

САЛА́М (Salam) Абдус (29.1.1926, Джханг, Пакістан — 21.11.1996), пакістанскі фізік-тэарэтык. Чл. Пакістанскай АН (1954), Лонданскага каралеўскага т-ва (1959). Замежны чл. АН СССР (1971), Нац. АН ЗША (1979) і інш. Скончыў Пенджабскі (1946) і Кембрыджскі

А.Салам.

(1949) ун-ты. З 1951 праф. Пенджабскага ун-та і Урадавага каледжа (г. Лахор). З 1954 у Кембрыджскім ун-це, у 1957—93 праф. Імперскага каледжа навукі і тэхналогіі Лонданскага ун-та. Адначасова ў 1964—93 дырэктар Міжнар. цэнтра тэарэт. фізікі (г. Трыест, Італія). У 1972—78 віцэ-прэзідэнт Міжнар. саюза тэарэт. і прыкладной фізікі. Навук. працы па квантавай электрадынаміцы, тэорыі элементарных часціц, гравітацыі. Паказаў (незалежна ад Л.Д.*Ландау, Лі Цзундао* і *Янга*), што ў слабым і эл.-магн. узаемадзеяннях захоўваецца камбінаваная цотнасць. Прапанаваў тэорыю двухкампанентнага нейтрына (1956). Развіў ідэю аб'яднання слабага і эл.-магн. ўзаемадзеянняў (1958; разам з аўстрал. фізікам Дж. Уордам), распрацаваў адзіную тэорыю гэтых узаемадзеянняў (1968, незалежна ад С.*Вайнберга*). Прапанаваў гіпотэзу глюонаў (1973) і ідэю Вялікага аб'яднання (1973—74). Каралеўскі медаль Лонданскага каралеўскага т-ва (1978). Вялікі залаты медаль імя Ламаносава АН СССР (1984). Нобелеўская прэмія 1979 (разам з Ш.Л.*Глэшаў* і Вайнбергам).

Тв.: Рус. пер. — Фундаментальная теория материи // Успехи физ. наук. 1969. Т. 99, вып. 4; Калибровочное объединение фундаментальных сил // Там жа. 1980. Т. 132, вып. 2.

М.М.Касцюковіч.

САЛАМА́НДРАВЫЯ, саламандры сапраўдныя (Salamandridae), сямейства хвастатых земнаводных. Каля 15 родаў, больш за 50 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. Афрыцы і Паўн. Амерыцы. Жывуць у вільготных лясах, па берагах вадаёмаў, трапляюцца да выш. 3 тыс. м. Актыўныя ў прыцемку і ўначы. Найб. вядомыя роды — *трытоны*, уласна С. (Salamandra), С. даўгахвостыя (Mertensiella). З роду ўласна С. найб. пашырана (Цэнтр і Паўд. Еўропа, Паўн.-Зах. Афрыка, Паўд.-Зах. Азія) С. плямістая, або вогненная (S. salamandra).

1

Даўж. да 70 см. Пазванкі выгнутыя назад. Зубы на абодвух сківіцах. У дарослых С. жабраў няма, дыхаюць лёгкімі. Сакрэт скурных залоз некат. С. (у т.л. С. плямістай) ядавіты. Апладненне ўнутранае. Адкладваюць ікру, ёсць яйцажывародныя і жывародныя. Кормяцца дробнымі беспазваночнымі. С. выкарыстоўваюць як лабараторных жывёл. С. наз. таксама некат. хвастатых земнаводных з інш. сям. (С. іспалінскія, С. бязлёгачныя, С. акулярныя).

А.М.Петрыкаў.

«САЛАМА́НДЭР» (Salamander), абутковая кампанія Германіі, найбуйнейшая ў Зах. Еўропе па выпуску абутку. Вырабляе таксама сродкі догляду абутку, скураныя вырабы, хімікаты, вырабы з фарфору, займаецца страхавымі і фін. аперацыямі, гандлем. Засн. ў 1885 як абутковая ф-ка І.Сігле, з 1930 — сучасная назва. Размешчана ў г. Карнвестгайм. Мае 11 з-даў, у т.л. 8 у Германіі, дачыныя фірмы ў Швейцарыі, Аўстрыі і Францыі. Занята ў вытв-сці 3,3 тыс. чалавек. На Беларусі працуе сумеснае з «С». прадпрыемства *«Белвест»*.

Саламанка. Кафедральны сабор.

САЛАМА́НКА (Salamanca), горад у цэнтр. ч. Іспаніі, у аўт. вобласці Кастылія-Леон, на р. Тормес. Адм. ц. аднайм. правінцыі. Каля 160 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: харч., тэкст., гарбарна-абутковая. 2 ун-ты.

3 5 ст. да н.э. згадваецца як умацаванае паселішча племя ветонаў. У 3 ст. да н.э. завявана карфагенянамі, у 2 ст. да н.э. — рымлянамі. У 8—11 ст. н.э. (з перапынкамі) пад уладай арабаў. У час *Рэканкісты* горад амаль апусцеў, зноў заселены ў 1102. У 1218 засн. *Саламанкскі універсітэт*, у 1254 бібліятэка. У 1520 С. — цэнтр паўстання *камунерас*. У 16—17 ст. цэнтр сукнаробства і кнігадрукавання.

2

Да арт. **Саламандравыя.** Саламандры: 1 — плямістая; 2 — каўказская.

22.7.1812 войскі А.*Уэлінгтана* і іспан. партызаны разбілі каля С. франц. войска. У час *Іспанскай рэвалюцыі 1931—39* у С. (з 1936) знаходзілася рэзідэнцыя Ф.*Франка Баамондэ*.

Горад-ансамбль С. вызначаецца адносна рэгулярнай планіроўкай вуліц, аднародным буд. матэрыялам (залацісты пясчанік), стыліставым падабенствам будынкаў (пераважна стылі платэрэска і чурыгерэска). Шматлікія архітэктурныя помнікі надаюць гораду выгляд музея: рым. мост з 15 арак, раманскія сабор (1140—60) і касцёл Томаса Кентэрберыйскага (перабудаваны ў 15 ст.), кафедральны сабор з рысамі готыкі і барока (1513—1733, арх. Р.Хіль дэ Антаньён і інш.), кляштар дамініканцаў і касцёл Сан Эстэбан (1524—1610), езуіцкая семінарыя (1617—1755), касцёл кляштара аўгусцінцаў (1636—87, размалёўкі Хасэ дэ Рыбейры) і інш. У стылі платэрэска — комплекс універсітэцкіх будынкаў (канец 15—16 ст.). На цэнтр. гар. плошчы Пласа Маёр (1729—55, арх. А. дэ Чурыгера і інш.) ансамбль будынкаў у стылі барока (чурыгерэска). Старая ч. С. ўключана ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

САЛАМА́НКСКІ УНІВЕРСІТЭ́Т, адзін са старэйшых ун-таў Іспаніі і Еўропы. Засн. ў 1218 у г. Саламанка. У эпоху Адраджэння адзін з найб. навук. і культ. цэнтраў Еўропы. У ім зроблены першыя пераклады твораў *Ібн Сіны*, *Ібн Рушда* і інш. вучоных; яго прафесараў запрашалі выкладаць у іншыя еўрап. ун-ты. Дзярж. ўстанова. Навучанне вядзецца на іспан. мове. У 1995/96 навуч. г. каля 31 тыс. студэнтаў; ф-ты: філал.; філас.; геаграфіі і гісторыі; права; прыгожых мастацтваў; прамысл. тэхнікі; навук; хім.; біял.; мед.; фармакалогіі; эканомікі і бізнесу; сац. навук; перакладаў і дакументацыі; псіхалогіі; педагогікі і адукацыі. У складзе ун-та школы (падрыхтоўкі настаўнікаў, адукацыі, політэхн., тапаграфіі і інш.), ін-ты (педагогікі і адукацыі, універсітэцкая бальніца), выдавецкі дом, Цэнтр. б-ка (140 тыс. тамоў), б-кі ф-таў (больш за 365 тыс. тамоў).

В.М.Навумчык.

САЛАМА́ТАЎ Ілья Ільіч (27.7.1907, в. Малая Бярсеніха Уржумскага р-на Кіраўскай вобл., Расія — 3.1.1989), бел. вучоны ў галіне хім. машынабудавання. Чл.-кар. АН Беларусі (1969), д-р тэхн. н. (1962), праф. (1971). Скончыў Маскоўскі ін-т хім. машынабудавання (1934). З 1946 ва Усесаюзным НДІ хім. машынабудавання (нам. дырэктара, у

1959—65 дырэктар). У 1967—77 у Ін-це ядз. энергетыкі АН Беларусі (нам. дырэктара). Навук. працы па радыяцыйнай хім. машынабудаванні, радыяцыйнай хіміі. Прапанаваў канструкцыі вакуумнага абсталявання для атамнай прам-сці, выкарыстанне ультрагуку і вібрацыйнай тэхнікі для інтэнсіфікацыі працэсаў растварэння і экстракцыі. Дзярж. прэмія СССР 1949.

І.І.**Саламатаў**.

Я.**Саламевіч**.

Тв.: Использование изотопов и излучений в народном хозяйстве Белорусской ССР // Весці АН БССР. Сер. фіз.-энергетыч. навук. 1971. № 2; Образование карбонильных соединений при радиолизе этиленгликоля в метаноле // Там жа. 1977. № 1.

Літ.: И.И.Саламатов // Весці АН БССР. Сер. фіз.-энергетыч. навук. 1977. № 4.

САЛАМА́ХА Уладзімір Пятровіч (н. 24.3.1949, в. Бераснёўка Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1975). Працаваў у Дзярж. камітэце Беларусі па кінематаграфіі (1975—83). З 1983 у час. «Маладосць». Друкуецца з 1966. Аўтар зб-каў прозы «На ўзмежку радасці» (1980), «Заўтра ў дарогу» (1985), «Кавалёк — лесавая былінка» (1988), «Цяпло чужога сэрца» (1990), «Прывід у скураным крэсле» (1994), «Апазнаецца асоба мужчыны...» (1998), «Напрадвесні» (2001). Героі яго твораў — сучаснікі, якія шукаюць сваё месца ў жыцці. Напісаў шэраг сцэнарыяў дакумент. і мультфільмаў.

Тв.: Званыя і выбраныя. Мн., 1999.

Літ: Гардзей В. Зямное і зорнае ў творчасці Уладзіміра Саламахі // Бел. думка. 2000. № 1. *І.У.Саламевіч.*

САЛАМЕ́ВІЧ Янка (Іван Уладзіміравіч; н. 29.10.1938, в. Малая Кракотка Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. літаратуразнавец, фалькларыст, бібліёграф, перакладчык. Канд. філал. н. (1971). Скончыў БДУ (1960). Працаваў у выд-вах. З 1968 у выд-ве «Беларуская Энцыклапедыя». Адначасова ў 1987—97 выкладаў у БДУ. Даследуе гісторыю бел. л-ры і культуры, фальклор. Увёў у навук. ўжытак невядомыя матэрыялы пра жыццё і творчасць пісьменнікаў Ф.Багушэвіча, Я.Лучыны, А.Гурыновіча, Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, М.Гарэцкага, М.Арла, З.Верас, Т.Гардзялкоўскай, А.Зязюлі, К.Лейкі, Г.Леўчыка, Ф.Шантыра, У.Дубоўкі, фалькларыстаў і этнографаў Біруты, П.Дземідовіча, Р.Зянькевіча, Ч.Пяткевіча, М.Федароўскага і інш. Аўтар першага на Беларусі «Слоўніка беларускіх псеўданімаў (XVI—XX стст.)» (1983), манаграфіі «Міхал Федароўскі» (1972). Склаў бібліягр. даведнік «Беларускі фальклор (1926—1963)» (1964), кн. «М.Гарэцкі: Успаміны, артыкулы, дакументы» (1984, з А.Лісам), зб-кі Г.Леўчыка «Доля і хлеб» (1980, з Н.Ляшковіч), М.Арла «Лірнік» (1991), Я.Купалы «Вершы і паэмы» (1991, на рус. мове), «П'есы XIX — пачатку XX ст.» (1998), выбр. творы Я.Чачота «Свіцязь» (1999), зб-кі «Беларускія загадкі» (1982, 1989), «Мама Мышка сушыла шышкі: Беларускія народныя скорагаворкі» (1983), літ.-маст. каляндар «Кола дзён» (1987, 1988, у саўт.), «Каляндар памятных дат 2001» (2001). На бел. мову пераклаў манаграфію «Беларуская казка» і паказальнік «Сюжэты і матывы беларускіх народных казак» Л.Барага, падручнік «Гісторыя беларускай савецкай музыкі», кн. Федароўскага «Люд беларускі: Вяселле», аповесць «Адысей з Беларусі» В.Гузанава, «Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану» Л.Патоцкага, раманы «Зверабой» Дж.Ф.Купера, «Блукаючыя зоркі» Шолам-Алейхема (з Г.Шупенькам) і інш. У 1979—88 адзін з вядучых тэлечасопіса «Роднае слова». Дзярж. прэмія Беларусі 1976.

Тв.: Помнік народнага мудраслоўя // Полымя. 1987. № 1; Праз гады // Там жа. 1992. № 11—12.

Літ.: Трыгубовіч В. Легла песня на душу // Так мы жывём. Мн., 1984.

А.В.Спрынчан.

САЛАМЕ́НКА Мікалай Сцяпанавіч (5.12.1923, Мінск — 25.6.1995), расійскі вучоны ў галіне буд. механікі. Акад. Рас. АН (1984, чл.-кар. 1979). Скончыў Вышэйшае ваенна-марское інж. вучылішча ў Ленінградзе (1946). З 1946 у Цэнтр. НДІ (у 1971—84 нам. дырэктара), адначасова з 1951 у Ленінградскім ун-це. З 1984 нам. старшыні Прэзідыума Санкт-Пецярбургскага цэнтра і з 1988 дырэктар-арганізатар Ін-та праблем транспарту Рас. АН. Навук. працы па механіцы дэфармавальнага цвёрдага цела, буд. механіцы карабля, статыцы і дынамікі інж. збудаванняў, фундаментальных праблемах трансп. сістэм і трансп. працэсаў. Дзярж. прэмія СССР 1984.

Тв.: Прочность и устойчивость пластин и оболочек судового корпуса. Л., 1967 (разам з К.Г.Абрамянам, У.В.Сарокіным).

САЛАМІ́Н (Salamis), востраў у Эгейскім моры каля ўзбярэжжа Атыкі (Грэцыя). З-за зручнага геагр. размяшчэння доўгі час быў аб'ектам барацьбы паміж Афінамі і Мегарамі. Каля 600 да н.э. захоплены афінянамі. У час *грэка-персідскіх войнаў* 28.9.480 да н.э. ў Саламінскім прал. адбылася марская бітва, у якой грэчаскі флот (больш за 350 трыер) пад камандаваннем спартанца Эўрыбіяда і стратэгічным кіраўніцтвам Фемістокла разграміў перс. флот (800 караблёў). Перамогу грэкам забяспечылі добра выбраная пазіцыя (двайны фронт уздоўж берага востраў з апорай флангаў на прыбярэжныя водмелі) і ўмелае выкарыстанне баявых сродкаў (лёгкія трыеры супраць цяжкіх караблёў). Персы страцілі 200 караблёў, грэкі — 40.

Літ.: Дельбрюк Г. История военного искусства: Пер. с нем. Т. 1. СПб., 1994; История войн. Т. 1. Ростов н/Д, 1997; Харботл Т. Битвы мировой истории: Словарь: Пер. с англ. М., 1993. *А.Г.Зельскі.*

САЛАМІ́РСКАЕ ВО́ЗЕРА. У Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Крашанка, за 20 км на Пд ад г. Полацк. Пл. 0,4 км^2, даўж. 1,4 км, найб. шыр. 440 м, найб. глыб. 2,9 м, даўж. берагавой лініі каля 4 км. Пл. вадазбору 5,5 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу. Схілы выш. 3—6 м, спадзістыя, пад лесам і хмызняком, часткова разараныя. Пойма шыр. 10—300 м, забалочаная, укрыта хмызняком. Берагі нізкія, забалочаныя, на ПнЗ, Пн і У сплавінныя. З залівы. Дно плоскае, у прыбярэжнай зоне да глыб. 1,5 м пясчанае, глыбей сапрапелістае. Зарастае. Упадае ручай з воз. Ляшчынава. Пасяленні баброў.

САЛАМО́Н (стараж.-яўр. Шэлома), цар Ізраільска-Іудзейскага царства [каля 960—935 да н.э.]. Сын цара *Давіда* і яго суправіцель у 967—965 да н.э. Правёў шэраг рэформ: племянны падзел краіны замяніў .тэрытарыяльным (12 адм.-тэр. акруг), стварыў разгалінаваны адм. апарат. Увёў цвёрдую сістэму падаткаў, ваен. і працоўнай павіннасцей, умацаваў армію. Для цэнтралізацыі культу бога Яхве пабудаваў у Іерусаліме храм (т.зв. храм Саламона). Заключыў саюз з Фінікіяй і Егіптам (ажаніўся з дачкой егіп. фараона). Пры С. развіваўся марскі і караванны гандаль. Паводле біблейскай традыцыі, С. вызначаўся незвычайнай мудрасцю; яму прыпісваецца аўтарства шэрагу кніг *Біблії* (Песня песням, Эклезіяст, Прытчы, Псалтыр і інш.). Пасля яго смерці дзяржава распалася на *Ізраільскае царства* і *Іудзейскае царства*.

САЛАМО́НАВА ПЯЧА́ТКА, кветкавая расліна, тое, што *купена*.

САЛАМО́НАВЫ АСТРАВЫ́ (Solomon Islands), вулканічны архіпелаг у паўд.-зах. ч. Ціхага ак., у Меланезіі, на У ад в-ва Новая Гвінея. Пл. 40,4 тыс. км^2. Найб. а-вы: Бугенвіль, Гуадалканал, Санта-Ісабель, Малаіта, Сан-Крыстобаль, Нью-Джорджыя, Шуазёль. Выш. да 2743 м (на в-ве Бугенвіль), ёсць дзеючыя вулканы (Балбі, Багана). Клімат субэкватарыяльны, вельмі вільготны. Сярэднямесячныя т-ры ад 26 °С да 28 °С. Ападкаў ад 2300 да 7500 мм за год. Кароткія мнагаводныя рэкі. Вечназялёныя лясы, у найб. сухіх месцах — саванны, па берагах — мангры. Вырошчваюць трапічных культур. Рыбалоўства. Адкрыты ў 1568 ісп. мараплаўцам А. Менданья дэ Нейра. Паўн.-зах. ч. (а-вы Бука і Бугенвіль) уваходзіць у склад тэр. дзяржавы *Папуа—Новая Гвінея*, астатнія — тэр. дзяржавы *Саламонавы Астравы*.

САЛАМО́НАВЫ АСТРАВЫ́ (Solomon Islands), дзяржава на Пд3 Ціхага ак. Займае паўд.-ўсх. ч. *Саламонавых астравоў*, а-вы Санта-Крус і інш. Пл. 28,4 тыс. км². Нас. 466,2 тыс. чал. (2000). Дзярж. мова — англійская, шырока выкарыстоўваецца англа-меланезійскі піджын (спрошчаная мова). Сталіца — г. *Ханіяра* на в-ве Гуадалканал. Краіна падзяляецца на 9 правінцый і сталічную акругу. Нац. свята — Дзень незалежнасці (7 чэрв.).

Дзяржаўны лад. С.А. — канстытуцыйная манархія, чл. Садружнасці. Дзейнічае канстытуцыя 1978, паводле якой кіраўнік дзяржавы — брыт. манарх, якога прадстаўляе ген.-губернатар. Вышэйшы орган заканад. улады — аднапалатны Нац. парламент (з 50 чл., якіх насельніцтва выбірае на 4 гады). Урад краіны (Нац. кабінет) складаецца з 15 міністраў на чале з прэм'ер-міністрам.

Прырода. На астравах (Гуадалканал, пл. 5,3 тыс. км²; Малаіта, пл. 4,1 тыс. км²; Санта-Ісабель, пл. 3,7 тыс. км²; Сан-Крыстобаль, пл. 3 тыс. км²; Шуазёль, пл. 2,6 тыс. км²; Нью-Джорджыя, пл. 1,8 тыс. км²) горы вышэй за 1000 м, на ўзбярэжжах — вузкія нізіны. Ёсць дзеючыя вулканы, участкі вапняковых плато і раўнін. Радовішчы баксітаў, золата, фасфарытаў, руд медзі, цынку, свінцу, нікелю. Клімат субэкватарыяльны, вельмі вільготны. Сярэднямесячныя т-ры паветра 26—28 оС. Сярэднегадавая колькасць ападкаў 2000—4300 мм. Шмат кароткіх горных рэк. Зімой бываюць моцныя ўраганы. Пад лесам (сандалавае дрэва, пальмы, фікусы і інш.) 88% тэр., на в-ве Гуадалканал участкі саваннаў, па берагах астравоў мангры. Жывёльны свет бедны. Мора багатае рыбай і малюскамі. Нац. парк Куін-Элізабет на в-ве Гуадалканал, некалькі рэзерватаў. Астравы Нью-Джорджыя і Рэнел уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

Насельніцтва. Асн. насельніцтва (93%) — меланезійцы Саламонавых а-воў, падзяляюцца на дробныя народы і плямёны. Жывуць таксама папуасы, палінезійцы, мікранезійцы, невял. групы еўрапейцаў і кітайцаў. Мясц. насельніцтва размаўляе на 120 мовах і дыялектах. Вернікі пераважна англікане (34%), каталікі (19%), баптысты (17%), прэсвітэрыяне (11%) і інш. Сярэднегадавы прырост насельніцтва каля 3%. Сярэдняя шчыльн. 16 чал. на 1 км², больш шчыльна заселены прыбярэжныя раёны (50—100 чал. на 1 км²). У гарадах 19% насельніцтва. У г. Ханіяра каля 45 тыс. ж. (2000). У сельскай і лясной гаспадарцы і рыбалоўстве занята 24% эканамічна актыўнага насельніцтва, у прам-сці і будаўніцтве — 13%, у камерцыі, на транспарце і ў фінансах — 22%, у інш. абслуговых галінах — 41%.

Герб і сцяг **Саламонавых Астравоў**.

Гісторыя. С.А. заселены ў 2-м тыс. да н.э. продкамі меланезійцаў. Адкрыты ў 1568 ісп. мараплаўцам А.Менданьям дэ Нейра, зноў у 1767 англ. капітанам Ф.Картэрэтам. У 19 ст. насельніцтва С.А. моцна пацярпела ад еўрап. гандляроў рабамі, якія вывезлі многіх іх жыхароў для працы на плантацыях Аўстраліі і астравах Ціхага акіяна. З 1893—1900 б. частка С.А. — пратэктарат Вялікабрытаніі. У 2-ю сусв. вайну акупіраваны Японіяй, у 1942—43 на в-ве Гуадалканал і на моры вакол яго адбылася адна з найб. бітваў паміж яп. і амер. войскамі і флатамі. У 1960 прынята канстытуцыя, паводле якой створаны заканад. і выканаўчы саветы. Новая канстытуцыя 1976 дала астравам унутр. самакіраванне. 7.7.1978 абвешчана незалежнасць С.А. Вострай праблемай краіны застаюцца этнічныя супярэчнасці. У маі 2000 у сталіцы С.А. адбыліся буйныя сутыкненні на этнічнай глебе. У краіне дзейнічаюць паліт. партыі і арг-цыі: Каалiцыя сіл за нац. прымірэнне, Нар. саюзная партыя, Партыя нац. дзеяння С.А.

Гаспадарка. С.А. — слабаразвітая с.-г. краіна. Валавы ўнутр. прадукт складае каля 1,15 млрд. дол. (1998), каля 2600 дол. на чалавека. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 90 тыс. га зямлі, у т.л. 60 тыс. га пад ворывам і шматгадовымі культурамі, 30 тыс. га пад пашай і лугамі. Пераважаюць дробныя сялянскія гаспадаркі, ёсць плантацыі экспартных культур, якія належаць замежным кампаніям. Экспартныя культуры: какосавая і алейная пальмы, какава, імбір, карычнае і гваздзіковае дрэвы. Штогадовая вытв-сць копры каля 50 тыс. т, пальмавага алею каля 20 тыс. т. На свае патрэбы вырошчваюць ямс, тара, батат, бананы, арахіс, тытунь, сою, рыс, перац, фасолю, агародніну. Трапічнае і субтрапічнае садоўніцтва. Жывёлагадоўля развіта слаба. Мясц. жыхары гадуюць свіней і птушак (у 2000 — 185 тыс. курэй). Ёсць некалькі буйных жывёлагадоўчых прадпрыемстваў, дзе трымаюць каля 25 тыс. галоў буйн. раг. жывёлы. Рыбалоўства і промысел малюскаў. У 2000 вылаўлена 53,4 тыс. т рыбы (пераважна тунец і баніта). Прам-сць занята ў асн. перапрацоўкай с.-г. прадукцыі. Вытв-сць электраэнергіі 30 млн. кВт · гадз (1998). Ёсць прадпрыемствы рыбамаразільныя і рыбаконсервавыя, па вытв-сці пальмавага алею, першаснай перапрацоўцы тытуню, апрацоўцы трэпангаў і спецый, швейныя, мукамольныя, хлебапякарныя, безалкагольных напіткаў. Развіты лесанарыхтоўка, лесапільная і дрэваапр. прам-сць. Мэблевыя ф-кі працуюць пераважна на ўнутр. рынак. Невял. здабыча баксітаў, фасфарытаў, медных і нікелевых руд. З рамёстваў найб. развіты разьбярства па дрэве, выраб сувеніраў з перламутру, цыновак, кошыкаў і лодак. Важнае месца займае замежны турызм (каля 20—25 тыс. чал. штогод, пераважна з Аўстраліі, ЗША, Новай Зеландыі, даход у 1998 склаў 13 млн. дол.). Транспарт пераважна марскі, гал. порт — г. Ханіяра. На астравах 1360 км аўтадарог, з іх толькі 34 км з цвёрдым пакрыццём. Для пасаж. сувязей выкарыстоўваецца авіятранспарт, у краіне 33 аэрапорты, у т.л. міжнар. каля г. Ханіяра. У 1996 экспарт склаў 184 млн. дол., імпарт — 151 млн. долараў. У экспарце пераважаюць копра, драўніна, пальмавы алей, рыба і рыбапрадукты; у імпарце — паліва, прамысл. і спажывецкія тавары. Гал. гандл. партнёры: Японія (50% экспарту, 10% імпарту) і Аўстралія (42% імпарту). Краіна атрымлівае пас-



таянную эканам. дапамогу ад міжнар. арг-цый, а таксама ад Вялікабрытаніі, Аўстраліі, Японіі, Новай Зеландыі. Грашовая адзінка — долар С.А.

Літ.: Малаховский К.В. Соломоновы острова. М., 1978.

І.Я.Афнагель (прырода, насельніцтва, гаспадарка).

І.М.**Саламонікаў**.

САЛАМО́НАЎ Аляксей Андрэевіч (н. 14.8.1925, в. Кледнявічы Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. геадэзіст. Д-р тэхн. н., праф. (1970). Скончыў БСГА (1951), дзе і працаваў з 1955 (з 1969 заг. кафедры). З 1974 у Бел. тэхнал. ун-це (заг. кафедры). З 1996 у выд-ве «Беларуская Энцыклапедыя». З 1997 праф. БСГА і адначасова праф.-кансультант ін-та «Белдзіпразем». Навук. працы ў галіне пабудовы і матэм. апрацоўкі геад. сетак. Прапанаваў метады стварэння і апрацоўкі геад. апоры, агульназямельнага кадастру і землеўпарадкавання, дэмаркацыі дзярж. мяжы. Удзельнічаў у стварэнні астранома-геад. сеткі ў Беларусі і прылеглых да яе тэр., а таксама ў Егіпце. Аўтар падручнікаў і навуч. дапаможнікаў для ВНУ.

Тв.: Инженерная геодезия. Мн., 1983; Геодезическое обеспечение строительства реакторных отделений современных АЭС (разам з М.К.Стуліным, М.П.Дварэцкім) // Энергетич. стр-во. 1986. № 3; Совершенствование государственной геодезической опоры Республики Беларусь (у сааўт.) // Геодезия и картография. 2000. № 5. *М.П.Савік.*

САЛАМО́НІ (Solomoni) Джузепе (Іосіф), італьянскі артыст балета, балетмайстар, педагог канца 18 — пач. 19 ст. У 1770-х г. працаваў у Вене. З 1782 у Маскве, танцоўшчык, з 1784 — пастаноўшчык балетаў у Пятроўскім т-ры М.Медокса, з 1800 — вядучы балетмайстар. Адначасова настаўнік танцаў і балетмайстар прыгонных т-раў у 1786 графа М.Шарамецева, у 1810—22 князя М.Юсупава. З 1810 выкладаў танцы ў Маск. шляхетным пансіёне, у 1822 — у Маск. ун-це. Паставіў больш за 30 балетаў. Сярод іх на рус. сцэне: «Апалон і Дафна» Ф.Філідора (1799), «Жывы мярцвяк», «Туалет Венеры» і «Гарацыі і Курыяцыі» І.Старцэра (1801—02), «Апелес і Кампаспа, ці Перамога Аляксандра над самім сабой» і «Помста за смерць Агамемнана» Ф.Аспельмайра (1803—05). *С.В.Гуткоўская.*

САЛАМО́НІКАЎ Іван Міхайлавіч (20.2.1918, в. Калінавая Магілёўскага р-на — 24.10.1944), Герой Сав. Саюза (1940). Скончыў артыл. вучылішча і курсы камандзіраў дывізіёнаў пры Ваен. акадэміі імя Дзяржынскага (1942). У Чырв. Арміі з 1938. У сав.-фінл. вайну 1939—40 радавы С. вызначыўся ў баі на Карэльскім перашыйку ў ноч на 22.12.1939 у час атакі пазіцыі ворага. У Вял. Айч. вайну на фронце з 1941, камандзір зенітна-артыл. палка. Прапаў без вестак у баі на тэр. Венгрыі.

САЛАМЯРЭ́ЦКІЯ, княжацкі род герба «Равіч» у ВКЛ. Па паходжанні *Рурыкавічы*, прозвішча ад маёнтка Саламярэч (цяпер в. Саламарэчча Мінскага р-на). Паходзяць ад Івана Дзмітрыевіча (мянушка Шах), унука смаленскага вял. кн. Святаслава Глебавіча (?—1310). Найб. вядомыя:

Васіль Іванавіч (?—1540?), дзяржаўца кернаўскі ў 1513, намеснік любашанскі ў 1518, дзяржаўца магілёўскі з 1520. Заснаваў у Саламярэчы манастыр. Іван Васілевіч (?—1577 або 1578), першы кашталян мсціслаўскі з 1566. Багдан Іванавіч (?—1602), староста крычаўскі і алучыцкі з 1580. Праціўнік Брэсцкай царк. уніі 1596, падтрымліваў правасл. брацтвы. Багдан Багданавіч (? — каля 1630), у 1626 з сястрой Аленай заснаваў у мяст. Баркулабава правасл. мужчынскі манастыр. Багдан Васілевіч (? — 1565), дзяржаўца айнаўскі ў 1555, дзяржаўца (староста) рагачоўскі з 1559. Удзельнічаў у Лівонскай вайне 1558—83. Мікалай Леў (? — 1626), падкаморы пінскі ў 1608—23, кашталян смаленскі з 1623. Ян Уладзіслаў (? — люты 1641), маршалак пінскі з 1629. З яго смерцю род С. згас.

САЛАНЕ́ВІЧ Іван Лук'янавіч (13.11.1891, в. Руднікі Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. — 24.4.1953), бел. і рускі публіцыст, выдавец, філосаф, гісторык, пісьменнік, грамадскі і спарт. дзеяч. Сын Л.М.*Саланевіча*. Скончыў Петраградскі ун-т (1916). З 1909 працаваў у газ. бацькі «Белорусская жизнь» (Вільня), з 1912 — у газ. «Новое время» (Пецярбург). Віцэчэмпіён Расіі па гіравым спорце, арганізатар спарт. т-ваў «Сокал» у Гродне і Віцебску (1908—10). Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 удзельнік грамадз. вайны на баку белых. З 1926 у Маскве. У 1933 за спробу ўцячы з СССР зняволены і накіраваны на буд-ва *Беламорска-Балтыйскага канала*. У жн. 1934 з сынам уцёк з лагера і прабраўся ў Фінляндыю. Потым у Балгарыі, дзе напісаў кнігу «Расія ў канцлагеры» (1936), выдаваў газ. «Голос России» (1936—38), якая стала цэнтрам рас. правапатрыят. эміграцыі, распаўсюджвалася ў 52 краінах, у т.л. даходзіла да Зах. Беларусі. Прапагандаваў ідэю «нацыянальнай праваслаўнай манархіі». Пасля забароны газеты балг. ўладамі (1938) пераехаў у Германію, знаходзіўся пад наглядам гестапа. З 1948 у Аргенціне. Заснаваная ім у Буэнас-Айрэсе газ. «Наша страна» стала цэнтрам народна-манархічнага руху, які меў на мэце ўвядзенне ў Расіі ладу нар. манархіі. Асн. філас.-паліталагічная праца «Народная манархія» (у першай рэд. «Белая імперыя», 1952).

Тв.: Народная монархия. Мн., 1998.

Літ.: Черепица В.Н. Преодоление времени. Мн., 1996. *В.М.Чарапіца.*

САЛАНЕ́ВІЧ Лук'ян Міхайлавіч (20.10.1866—1938?), бел. і рускі журналіст і выдавец, краязнавец і грамадскі дзеяч. Бацька І.Л.*Саланевіча*. Скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю (1886), працаваў у нар. вучылішчах Гродзенскай губ. (1886—96), потым у Гродзенскім губ. праўленні (да 1907). Адначасова з канца 1890-х г. супрацоўнічаў у «Гродненских губернских ведомостях». Чл. Гродзенскага царк.-археал. к-та, манархісцкай арг-цыі *«Селянін»*. Разам з П.В. Каранкевічам заснаваў у 1908 *Беларускае таварыства*. Стаяў на пазіцыях *заходнерусізму*. Прыхільнік гіст. канцэпцыі М.В.*Каяловіча* і паліт. платформы П.А.*Сталыпіна*. З 1909 у Вільні, дзе пачаў выдаваць газ. *«Белорусская жизнь»* (з 1911 — *«Северо-Западная жизнь»*). З 1916 у Ялце (Крым). Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 адышоў ад журналісцкай і грамадскай дзейнасці. Пасля ўцёкаў сына Івана з СССР (1934) арыштаваны і паводле некаторых звестак загінуў у лагеры г.п. Севера-Енісейскі Краснаярскага краю. Рэабілітаваны ў 1989.

Літ.: Черепица В.Н. Преодоление времени. Мн., 1996. *В.М.Чарапіца.*

САЛАНЕ́КА Альберт Андрэевіч (н. 28.4.1937, г. Віцебск), бел. вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1985), праф. (1992). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1960). З 1966 у Бел. НДІ эксперым. ветэрынарыі (заг. лабараторыі), з 1987 у Віцебскай акадэміі вет. медыцыны (заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях туберкулёзу, інш. інфекц. захворванняў с.-г. жывёл.

Тв.: Микобактериоз свиней. Мн., 1988 (разам з І.І.Румачыкам).

САЛАНЕ́Ц, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Зах. Дзвіна, за 20 км на З ад г. Полацк. Пл. 0,48 км^2, даўж. 1,4 км, найб. шыр. 720 м, найб. глыб. 3,4 м, даўж. берагавой лініі 4,2 км. Пл. вадазбору 12,7 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу. Схілы выш. 2—5 м, спадзістыя, пад пашай, на ПдУ разараныя. На Пн і Пд забалочаная пойма шыр. 10—100 м, пад хмызняком. Берагі нізкія, пясчаныя, месцамі забалочаныя, на Пд сплавінныя. Некалькі заліваў. Востраў пл. 0,2 га. Дно сподкападобнае, сапрапелістае, прыбярэжная зона на З і У пясчаная. Зарастае. Упадаюць ручай і меліярацыйная канава, выцякае р. Валынка.

САЛАНІ́КСКІ ЗАЛІ́Ў, другая назва зал. *Тэрмаікос* у Эгейскім моры.

САЛАНО́Е, вёска ў Жлобінскім р-не Гомельскай вобл., на р. Добасна, каля аўтадарогі Жлобін—Светлагорск; чыг. ст. на лініі Жлобін—Светлагорск. Цэнтр сельсавета і Жлобінскай птушкафабрыкі. За 8 км на Пд ад г. Жлобін, 101 км ад Гомеля. 1464 ж., 487 двароў (2001). Пач. школа-сад, Дом культуры,

б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Царква. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі курганны могільнік (11 ст.).

САЛАНЦЫ́, глебы засушлівых абласцей, якія на невял. глыб. (20—80 см) утрымліваюць значную колькасць соды і інш. лёгкарастваральных солей. Фарміруюцца ва ўмовах непрамыўнога воднага рэжыму або пры рассаленні *саланчакоў*, пераважна ў комплексе з інш. глебамі.

Характарызуюцца вязкасцю і набраканнем у вільготным стане, моцным ушчыльненнем і цвёрдасцю ў сухім, слупкаватай, прызматычнай ці глыбістай структурай ілювіяльнага гарызонту, высокай рухомасцю калоідаў, малой водапранікальнасцю, маюць 0,5—8% гумусу ў верхнім гарызонце. Пакрыты саланцовай расліннасцю. Малаўрадлівыя, патрабуюць прамыўкі, гіпсавання і ўнясення арган. угнаенняў.

САЛАНЦЫ́, прыродныя месцы, дзе на паверхню глебы выходзяць пласты грунту ці крыніцы, багатыя солямі натрыю; таксама штучныя прыстасаванні для мінер. падкормкі дзікіх жывёл. Патрэба ў мінер. рэчывах павялічваецца ў жывёл у перыяд гону, цяжарнасці, лактацыі, лінькі, росту рагоў і інш., напр., для лася сутачная патрэба ў солі — 7 г. Штучныя С. размяшчаюць на вял. адлегласцях, каб не ствараць вял. канцэнтрацыі жывёл у адных угоддзях. Каля С. праводзяць назіранні за жывёламі.

САЛАНЧАКІ́, тып засоленых глеб, у паверхневым слоі якіх 1—15% (у глебавай скарынцы часам больш за 30%) лёгкарастваральных солей. Пашыраны ў зонах стэпаў, паўпустынь і пустынь на саляносных пародах (аўтаморфныя С.) або ва ўмовах блізкага залягання мінералізаваных грунтавых вод (гідраморфныя С.).

Характарызуюцца слабадыферэнцыраваным глебавым профілем, слаба выражаным гумусавым гарызонтам з прожылкамі ці плямамі солей, шчолачнай рэакцыяй. Расліннасць галафітная або адсутнічае. Малаўрадлівыя, прыдатныя для земляробства пасля гіпсавання, прамыўкі, паніжэння ўзроўню грунтавых вод. Пры рассаленні з С. фарміруюцца *саланцы*.

САЛА́ТА, латук пасяўны, салата-латук (Lactuca sativa), кветкавая расліна сям. складанакветных. Пашырана па ўсіх кантынентах у культуры. Радзіма — Міжземнамор'е, родапачынальнік — *латук* дзікі. Стараж. агароднінная культура.

Аднагадовая разеткавая расліна. Сцябло прамастойнае, уверсе разгалінаванае, выш. 60—200 см. Лісце разеткі буйное, жаўтаватазялёнае, суцэльнае, сядзячае, рознай формы, гладкае, маршчыністае, гафрыраванае або кучаравае, часта шчыльна змыкаецца ў качан. Кветкі дробныя, двухполыя, белыя або бледна-жоўтыя, у кошыку. Плод — сямянка. Разнавіднасці С.: ліставая пасяўная (скараспелая, напр., сорт Маскоўская парніковая); ліставая кучаравая (напр., Грэнд Рапідс); вузкалістая (напр., Латук позні); качанная (сартатыпы масляналістая, напр., Майская, і храсткаваталістая, або ледзяная, напр., Ледзяная гара) з качанамі плоска-акруглай формы; даўгалістая, С. Рамэн, (напр., сорт Парыжская зялёная) з качаном падоўжана-авальнай формы. Ужываюць свежымі лісце, качан, патоўшчанае сцябло. Лісце мае ў сабе вітаміны (С, В, РР і інш.), карацін, солі жалеза, калію, фосфару, сцябло — *млечны сок*, які выкарыстоўваецца ў медыцыне, насенне — алей. Харч., лек. расліна.

САЛАЎ́ХІН Рэм Іванавіч (19.11.1930, г. Гусь-Хрустальны Уладзімірскай вобл., Расія — 6.1.1988), расійскі і беларускі вучоны ў галіне эксперым. фізікі, механікі і газадынамікі. Чл.-кар. АН СССР (1968). Акад. АН Беларусі (1977), д-р фіз.-матэм. н. (1964), праф. (1965). Скончыў Маскоўскі ун-т (1953). З 1959 у Сібірскім аддз. АН СССР (у 1971—76 дырэктар Ін-та тэарэт. і прыкладной механікі). У 1976—87 дырэктар Ін-та цепла- і масаабмену АН Беларусі. Навук. працы па фізіцы гарэння і выбуху, лазераў і нізкатэмпературнай плазмы, высокатэмпературнай газадынаміцы. Выявіў заканамернасці фізікі ўдарных хваль і кінетыкі рэлаксацыйных працэсаў, ускладненых іанізацыйнымі з'явамі, хім. рэакцыямі і фазавымі пераўтварэннямі. Распрацаваў асновы інтэнсіфікацыі і аптымізацыі цеплаэнергаабменных працэсаў у праточных лазерных сістэмах. Даследаваў лазерныя сістэмы з селектыўным цеплавым узбуджэннем. Ленінская прэмія 1965.

Тв.: Ударные волны и детонация в газах. М., 1963; Макроскопические и молекулярные процессы в газовых лазерах. М., 1981 (разам з У.М.Карнюшыным); Газодинамические лазеры на смешении. Мн., 1984 (разам з М.А.Фаміным).

Літ.: Неравновесная газодинамика: диагностика и моделирование: 60-летию Р.И.Солоухина посвящается: Сб. науч. тр. Мн., 1991.

САЛАЎ́ХІН Уладзімір Аляксеевіч (14.6.1924, с. Алепіна Собінскага р-на Уладзімірскай вобл., Расія — 4.4.1997), рускі пісьменнік, публіцыст. Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1951). Друкаваўся з 1945. Паэзія С. шырокага тэмат. (грамадз., пейзажная, любоўная), эмацыянальнага і рытміка-інтанацыйнага (ад верлібра да «вянка санетаў») дыяпазону (зб-кі «Дождж у стэпе», 1953; «Жыць на зямлі», 1965; «Аргумент», 1972; «Вершы», 1990). Лірычныя аповесці-нататкі «Уладзімірскія прасёлкі» (1957) і «Кропля расы» (1960) пра «малую радзіму» і лёсы сваіх аднавяскоўцаў. У эсэістычных кн. «Лісты з Рускага музея» (1966), «Чорныя дошкі» (1969), «Час збіраць камяні» (1980) роздум пра шляхі рус. мастацтва і нац. традыцыі. Аўтабіягр. аповесць «Смех за левым плячом» (1984) пра гады дзяцінства ў драм. часы калектывізацыі. Аўтар рамана «Маці-мачаха» (1964, пра студэнцкае жыццё), маст.-дакументальных кніг-інвектыў «Пры святле дня» (1992), «Салёнае возера» (1994), «Апошняя ступень» (1995), кн. публіцыстычных нататак, лірычных і анекдатычных былей «Каменьчыкі на далоні» (1977—92) і інш. На рус. мову пераклаў аповесці В.Гігевіча «Калі пойдзе снег» і «Жыцёва» (у пер. «Вяртанне памяці»). Яго вершы на бел. мову перакладалі П.Макаль, Я.Сіпакоў, В.Шымук, апавяданні — Я.Брыль, В.Вітка, Гігевіч, Г.Далідовіч, У.Дамашэвіч, А. Жук, А.Кудравец, Я.Лецка, М.Стральцоў, І.Чыгрынаў і інш.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—4. М., 1983—84; Созерцание чуда: Очерки. М., 1986; Возвращение к началу: Лирич. повесть и роман. М., 1990; Древо: [О представителях рода князей Волынских]. М., 1991; Бел. пер. — Пад адным дахам. Мн., 1984. *А.В.Спрынчан.*

Р.І.Салаухін.

У.А.Салаухін.

САЛА́Ў Ілья Аляксандравіч (18.4.1834, г. Пенза, Расія — 6.1.1903), рускі пісьменнік. Скончыў Пензенскую гімназію. З пач. 1850-х г. служыў чыноўнікам у Маскве, пазней жыў у Саратаўскай губ. Літ. дзейнасць пачаў з п'ес і перакладаў франц. меладрам. У апавяданнях, рамане «Бутузка» (1864) асуджэнне прыгонніцтва. Апавяданні 1870—80-х г. пера-

Разнавіднасці **салаты**: 1 — лісцевая; 2 — Рамэн; 3 — качанная.

важна пра паслярэформенную вёску. У аповесці «Грачоўскі кракадзіл» (1879) гісторыя прапагандысткі-рэвалюцыянеркі. Аўтар рамана «Утульны куток» (1894), аповесці «Практыка жыцця» (1895), п'ес «Залатая рыбка», «Стэпавы асілак» (абедзве 1886), «Дармаедка» (1888) і інш. Творчасці С. ўласцівы праўдзівыя побытавыя і партрэтныя замалёўкі.

Тв.: Грачевский крокодил: Повести и рассказы. М., 1984.

САЛАЎЁВА Ганна Сяргееўна (11.4.1922, г. Смела Чаркаскага р-на Кіеўскай вобл. — 11.11.2001), бел. вучоны ў галіне фтызіятрыі. Д-р мед. н. (1970), праф. (1973). Скончыла Харкаўскі мед. ін-т (1947). З 1971 заг. кафедры Віцебскага мед. ін-та. Навук. працы па асобных формах туберкулёзу, пытаннях бронхалагічнага даследавання, аэразольтэрапіі, метадах патагенет. лячэння.

САЛАЎЁВА Тамара Уладзіміраўна (н. 5.8.1935, г. Гдоў Пскоўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне перапрацоўкі драўніны. Д-р тэхн. н. (1998), праф. (1999). Скончыла Ленінградскую лесатэхн. акадэмію (1958). З 1963 у Бел. тэхнал. ун-це. Навук. працы па праблемах распрацоўкі малаадходных тэхналогій вытв-сці драўнянавалакністых і драўнянастружкавых пліт, новых кампазіцыйных матэрыялаў са спецыфічнымі ўласцівасцямі.

Тв.: Применение катионных полиэлектролитов в производстве древесноволокнистых плит. М., 1986; Технология древесной массы. Мн., 1999. *Я.Г.Міляшкевіч.*

САЛАЎЁЎ Аляксандр Аляксандравіч (н. 13.9.1926, в. Солані Лужскага р-на Ленінградскай вобл., Расія), бел. мастак тэатра, жывапісец. Засл. дз. маст. Беларусі (1982). Скончыў Ленінградскае вышэйшае маст.-прамысловае вучылішча імя В.Мухінай (1957), Бел. тэатр.-маст. ін-т (1965). У 1965—97 мастак-пастаноўшчык, у 1977—95 гал. мастак Бел. т-ра імя Я.Коласа. Аформіў спектаклі «Ветрык, вей!» Я.Райніса (1965), «Клоп» У.Маякоўскага (1968), «Марыя Сцюарт» Ф.Шылера (1969), «Зацюканы апостал» (1971) і «Таблетку пад язык» (1973) А.Макаёнка, «Трывога» А.Петрашкевіча, «Званы Віцебска» У.Караткевіча (абодва 1974), «Матухна Кураж і яе дзеці» Б.Брэхта, «Сымон-музыка» паводле Я.Коласа (абодва 1976), «Разгром» паводле А.Фадзеева (1977), «Кастусь Каліноўскі» Караткевіча, «Летась у Чулімску» А.Вампілава (абодва 1978), «Стары дом» А.Казанцава (1980), «Закон вечнасці» паводле Н.Думбадзе (1981), «Парог» (1982) і «Радавыя» А.Дударава, «Зінуля» А.Гельмана, «Пакрыўджаныя» Л.Родзевіча (усе 1994), «Рамэо і Джульета» У.Шэкспіра (1986) і інш. Афармленне вызначалася тонкім адчуваннем эмацыянальнай і духоўнай сутнасці твора і задумы рэжысёра. Аўтар жывапісных цыклаў «Фарбы зямлі» (1974—85), «Русь» (1975—85), «Тэатр» (1977—80), «Космас» (1978—82), графічных твораў і інш. *Ю.І.Іваноўскі.*

САЛАЎЁЎ Анатоль Якаўлевіч (н. 16.1,1948, Рыга, Латвія), расійскі касманаўт. Герой Сав. Саюза (1988). Лётчык-касманаўт СССР (1988), палкоўнік. Скончыў Чарнігаўскае вышэйшае ваен. авіяц. вучылішча лётчыкаў (1973), школу лётчыкаў-выпрабавальнікаў (1977). У 1976—2000 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю.А.Гагарына. Здзейсніў (як камандзір) 5 палётаў у складзе экіпажаў касм. караблёў (КК): 7—17.6.1988 на КК «Саюз ТМ-5» (старт), «Саюз ТМ-4» (пасадка) і арбітальнай станцыі (АС) *«Мір»*; 11.2—9.8.1990 на КК «Саюз ТМ-9» і АС «Мір»; 27.8.1992—1.2.1993 на КК «Саюз ТМ-15» і АС «Мір»; 27.6—11.9.1995 на КК «Атлантыс», АС «Мір» і КК «Саюз ТМ-21» (пасадка); 5.8.1997—19.2.1998 на КК «Саюз ТМ-26» і АС «Мір». У космасе правёў 651 сут (3-і вынік у свеце, 2001). Здзейсніў 16 выхадаў у адкрыты космас агульнай працягласцю 77,8 гадз (1-ы вынік у свеце, 2001). *У.С.Ларыёнаў.*

САЛАЎЁЎ Зіновій Пятровіч (22.11.1876, г. Гродна— 6.11.1928), адзін з арганізатараў аховы здароўя ў СССР. Скончыў Казанскі ун-т (1904). У 1918—20 нам. нар. камісара аховы здароўя РСФСР. З 1920 нач. Гал. ваен.-сан. ўпраўлення Чырв. Арміі, старшыня Рас. т-ва Чырв. Крыжа і Чырв. Паўмесяца, з 1923 адначасова праф. кафедры 2-га Маскоўскага ун-та. Навук. працы па пытаннях тэарэт. асноў аховы здароўя, вышэйшай мед. адукацыі, гісторыі медыцыны, ваен.-сан. справы. Па ініцыятыве і з удзелам С. ў 1925 створаны піянерскі лагер Артэк.

К.М.**Салаўёў**.

САЛАЎЁЎ Канстанцін Мікалаевіч (н. 30.3.1933, С.-Пецярбург), бел. фізік. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1994), д-р фіз.-матэм. н. (1970), праф. (1976). Скончыў БДУ (1956). З 1959 у Ін-це фізікі АН Беларусі (з 1972 заг. лабараторыі), з 1992 заг. лабараторыі Ін-та малекулярнай і атамнай фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па спектраскапіі і люмінесцэнцыі, даследаванні электронна-вагальных спектраў і электроннай структуры малекул тыпу хларафілу, а таксама працэсаў пераўтварэння энергіі светлавога ўзбуджэння ў іх. Прапанаваў дэталёвую інтэрпрэтацыю электронна-вагальных спектраў парфіну і яго аналагаў. Даследаваў нізкатэмпературныя рэакцыі фотатаўтамерызацыі, што дало пачатак новаму кірунку ў малекулярнай спектраскапіі высокага раздзялення — фотавыпальванне стабільных спектральных правалаў. Дзярж. прэмія Беларусі 1980. Дзярж. прэмія СССР 1986.

Тв.: Спектроскопия хлорофилла и родственных соединений. Мн., 1968 (разам з Г.П.Гурыновічам, А.Н.Сеўчанкам); Спектроскопия порфиринов: Колебательные состояния. Мн., 1985 (у сааўт.); Колебательная и электронно-колебательная спектроскопия тетрапиррольных пигментов // Фотобиология растений и фотосинтез. Мн., 1996.

Літ.: К.Н.Соловьев // Журн. прикладной спектроскопии. 1993. Т. 58, № 5/6.

САЛАЎЁЎ Мікалай Якаўлевіч (1845, г. Разань, Расія — 9.12.1898), рускі драматург. Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1865—69). Першая п'еса — «Куды падзецца» (1866). У гісторыю рус. т-ра ўвайшоў як аўтар п'ес, напісаных разам з А.Астроўскім: «Шчаслівы дзень» (1877), «Жаніцьба Бялугіна» (1878), «Дзікунка» (1880), «Свеціць, ды не грэе» (1881). Самастойна стварыў п'есы «На парозе да справы» (1879), «Мядовы месяц» (1881), «Ліквідацыя» (1883), «Выпадак выратаваў!» (1884) і інш. С. — майстар моўных характарыстык персанажаў, пабудовы канфлікту.

А.**Салаўёў**. Эскіз дэкарацыі да спектакля А.Вампілава «Летась у Чулімску». 1978.

Тв.: У кн.: Островский А.Н. Полн. собр. соч. М., 1977. Т. 8.

Літ.: Русская драма эпохи А.Н.Островского. М.. 1984.

САЛАЎЁЎ Сяргей Аляксандравіч (н. 25.8.1944), расійскі кінарэжысёр. Засл. дз. маст. Расіі (1976). Нар. арт. Расіі (1996). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1969). Як рэжысёр дэбютаваў у 1970 навеламі паводле апавяданняў А.Чэхава «Ад нечага рабіць» і «Прапанова» (у фільме «Сямейнае шчасце»). Для яго творчасці характэрны высокая культура пластычных рашэнняў, тонкасць і дакладнасць перадачы атмасферы, пераасэнсаванне рэчаіснасці, нечаканыя экстравагантныя прыёмы: «Станцыйны наглядчык» (паводле А.Пушкіна, 1972), «Ягор Булычоў і іншыя» (паводле М.Горкага, 1973), «Сто дзён пасля дзяцінства» (1975, прыз Міжнар. кінафестывалю ў Зах. Берліне; Дзярж. прэмія СССР 1977), «Мелодыі белай ночы» (1977, з Японіяй), «Спадчынніца па прамой» (1982), «Выбраныя» (1983, з Калумбіяй) «Аса» (1988), «Чорная ружа — эмблема смутку, чырвоная ружа — эмблема любові» (1990), «Дом пад зорным небам» (1992), «Пяшчотны ўзрост» (2000) і інш.

САЛАЎЁЎ Сяргей Міхайлавіч (17.5.1820, Масква — 16.10.1879), расійскі гісторык. Бацька У.С.*Салаўёва*. Чл. Пецярбургскай АН (1872). Д-р рускай гісторыі, праф. (1847). Скончыў Маскоўскі ун-т (1842), з 1847 выкладаў у ім, у 1871—77 рэктар. У апошнія гады жыцця старшыня Маскоўскага т-ва гісторыі і старажытнасцей расійскіх, дырэктар Аружэйнай палаты ў Крамлі. У гіст. і грамадска-паліт. поглядах эвалюцыяніраваў ад славянафільства да памяркоўна-ліберальнага заходніцтва. У гал. працы «Гісторыя Расіі з найстаражытнейшых часоў» (т. 1—29, 1851—79) проціпаставіў сваю гіст. канцэпцыю поглядам М.М.*Карамзіна*. Гіст. развіццё зводзіў да змен дзярж. форм, грамадска-паліт. жыццю адводзіў другарадную ролю. Адзначаў агульнасць рыс у развіцці Зах. Еўропы і Расіі, аднак своеасаблівасць апошняй бачыў у геапаліт. становішчы краіны, псіхалогіі народаў у яго ўзаемаадносінах з суседзямі. Гісторыю Беларусі разглядаў у кантэксце развіцця рас. дзяржаўнасці. Унутр. супярэчнасці ў Беларусі ў перыяд ВКЛ і Рэчы Паспалітай трактаваў найперш як рэліг. барацьбу насельніцтва супраць націску каталіцызму, станоўча ацэньваў ролю правасл. царквы ў гэтай барацьбе. У працы «Гісторыя падзення Польшчы» (1863) адлюстраваў гісторыю Беларусі канца 18 — пач. 19 ст. Факталагічны бок прац С. да нашага часу не страціў сваёй актуальнасці для вывучэння гісторыі Беларусі.

Тв.: Соч. Кн. 1—20. М., 1988—96.

Літ.: Иллерицкий В.Е. С.М.Соловьев. М., 1980; Цимбаев Н.И. Сергей Соловьев. М., 1990. *В.М.Чарапіца.*

САЛАЎЁЎ Уладзімір Аляксеевіч (н. 11.11.1946, Масква), савецкі касманаўт. Двойчы Герой Сав. Саюза (1984, 1986). Лётчык-касманаўт СССР (1984). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча імя М.Э.Баўмана (1970). З 1978 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю.А.Гагарына. 8.2—2.10.1984 з Л.Дз.*Кізімам* і А.Ю.Ацьковым здзейсніў (як бортінжынер) палёт на касм. караблі (КК) «Саюз Т-10» і арбітальнай станцыі (АС) «Салют-7» (пасадка на КК «Саюз Т-11»); 13.3—16.7.1986 з Кізімам — на КК «Саюз Т-15» і АС «Салют-7» і «*Мір*». У космасе правёў 361,95 сут, у т.л. ў адкрытым космасе 32 гадз. Кіраўнік палётаў АС «Мір», Міжнар. касм. станцыі (ад Расіі). *У.С.Ларыёнаў.*

САЛАЎЁЎ Уладзімір Сяргеевіч (16.1.1853, Масква — 31.7.1900), рускі рэліг. філосаф, паэт, публіцыст і крытык. Сын С.М.*Салаўёва*. Д-р філасофіі (1880). Скончыў Маскоўскі ун-т (1873). Выкладаў у Маскоўскім і Пецярбургскім ун-тах, на Вышэйшых жаночых курсах. У 1880-я г. выступаў пераважна як публіцыст (прапаведаваў уз'яднанне Усходу і Захаду праз аб'яднанне хрысц. цэркваў, змагаўся за свабоду сумлення і супраць нац.-рэліг. прыгнёту). У 1890 г. займаўся філас. і літ. дзейнасцю, перакладаў Платона, узначальваў філас. аддзел у «Вялікім энцыклапедычным слоўніку» Брактаўза і Эфрона (з 1891). Як мысліцель і утапіст С. знаходзіўся на перакрыжаванні розных філас. і рэліг. плыняў, а гал. сваёй задачай лічыў сумяшчэнне навук.-пазітыўнага і рацыяналістычнага «духу часу» з рэліг. светапоглядам. Яго філас. сістэма грунтуецца на ідэі ўсеадзінства, вучэнні пра Сафію (спрадвечную Божую мудрасць, у якой аб'яднаны ўсе сусв. ідэі), прапаведзі збаўлення свету ад разбуральнага ўздзеяння прасторы і часу і канцэпцыі «богачалавечага працэсу» як усеагульнага выратавання чалавецтва. Выступаў за «мірнае збліжэнне народаў», верыў у еднасць каталіцкай і правасл. цэркваў, лічыў, што кожны народ па-свойму служыць хрысц. рэлігіі. Крытыкаваў лідэраў славянафільства, але лічыў, што слав. народы «першымі закладуць фундамент свабоднай тэакратыі», падкрэсліваў, што культура велікарусаў, маларусаў і беларусаў спалучае рысы зах. і ўсх. культур. Паэзія С. тэматычна падпарадкавана яго філас. поглядам, спалучае традыц. паэтыку і рысы сімвалізму. Лірыка С., асабліва вершы «сафійнага» цыкла, паўплывалі на развіццё паэзіі рас. сімвалізму. Лічыў лірыку «адкрыццём чалавечай душы ў сугуччы з душой прыроды», а мастацтва ўвогуле — «тэургіяй», накіраванай на пераўтварэнне рэчаіснасці ў космас абсалютнай прыгажосці.

Тв.: Соч. Т. 1—2. М., 1989; Стихотворения. Эстетика. Литературная критика. М., 1990; Смысл любви: Избр. произв. М., 1991; О христианском единстве. М., 1994; Чтения о богочеловечестве; Статьи; Стихотворения и поэма; Из «Трех разговоров»: Краткая повесть об Антихристе. СПб., 1994.

Літ.: Лосев А.Ф. Владимир Соловьев. 2 изд. М., 1994; Соловьев С.М. Владимир Соловьев: Жизнь и творческая эволюция. М., 1997; Владимир Соловьев: pro et contra: Личность и творчество Владимира Соловьева в оценке мыслителей и исслед.: Антология. СПб., 2000; Фараджев К.В. Владимир Соловьев: Мифология образа. М., 2000.

В.М.Чарапіца.

САЛАЎЁЎ Юрый Уладзіміравіч (10.8.1940, С.-Пецярбург — 12.1.1977), расійскі артыст балета. Нар. арт. СССР (1973). Скончыў Ленінградскае харэагр. вучылішча (1958). З 1958 саліст Ленінградскага т-ра оперы і балета імя Кірава. Класічны танцоўшчык лірыка-драм. плана, майстар дуэтнага танца, валодаў фенаменальным скачком. Першы выка-

Ю.**Салаўёў** у ролі Блакітнай птушкі.

наўца партый: Юнак (паводле «Ленінградскай сімфоніі» Дз.Шастаковіча), Бог («Стварэнне свету» А.Пятрова), Чалавек («Далёкая планета» Б.Майзеля), Ясны Сокал («Краіна цудаў» І.Шварца), Ікар («Ікар» С.Сланімскага) і інш. Сярод інш. партый: Зігфрыд, Дэзірэ, Блакітная птушка («Лебядзінае возера», «Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Жан дэ Брыен («Раймонда» А.Глазунова), Салор («Баядэрка» Л.Мінкуса) і інш. Зняўся ў кінафільме-балеце «Спячая прыгажуня» (1964), тэлефільмах-канцэртах, у т.л. ў «Сімфоніі фантанаў» (1966), «Канстанцін Сяргееў. Старонкі харэаграфіі» (1976). Прэмія «Залатая зорка» на Міжнар. фестывалі танца (Парыж, 1965). *С.В.Гуткоўская.*



У.С.**Салаўёў**.

В.П.**Салаўёў-Сядой**.

А.Б.**Салаўяненка**.

САЛАЎЁЎ-СЯДО́Й (сапр. Салаўёў) Васіль Паўлавіч (25.4.1907, С.-Пецярбург — 2.12.1979), расійскі кампазітар, муз.-грамадскі дзеяч; адзін з буйнейшых майстроў сав. песні. Нар. арт. СССР (1967). Герой Сац. Працы (1975). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1936). У 1948—64 старшыня праўлення Ленінградскага аддзялення Саюза кампазітараў Расіі. У 1957—74 сакратар Саюза кампазітараў СССР, з 1960 — Саюза кампазітараў Расіі. Яго муз. стыль вылучаюць рус. нац. склад, апора на традыцыі нар. і быт. музыкі, глыбокі лірызм, прастата выказвання. Сярод твораў: балет «Тарас Бульба» (1940); аперэты «Самае запаветнае» (1951), «Алімпійскія зоркі» (1962) і інш.; музыка да спектакляў драм. т-ра і кінафільмаў, песні, у т.л. «Вечар на рэйдзе» (1941), «На сонечнай паляначцы» (1943), «Салаўі» (1944), «Дзе ж вы цяпер, сябры-аднапалчане» (1947), «Падмаскоўныя вечары» (1956), «Балада пра салдата» (1961) і інш. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1947. Ленінская прэмія 1959.

Літ.: Кремлев Ю. В.П.Соловьев-Седой: Очерк жизни и творчества. Л., 1960; Хентова С.М. Соловьев-Седой в Петрограде-Ленинграде. Л., 1984. *Л.А.Шымановіч.*

САЛАЎІ (Luscinia), род птушак сям. дразд овых атр. вераб'інападобных. 2 віды: С. звычайны, або ўсходні (L. luscinia), пашыраны на У Еўропы і ў Зах. Азіі, і С. паўднёвы, або заходні (L. megarhynchos), пашыраны ў Еўропе, Паўн.-Зах. Афрыцы і Паўд.-Зах. Азіі. Пералётныя. Жывуць на ўзлесках, у парках, садах. Гнёзды пераважна на зямлі. Песня багатая разнастайнымі гукамі (да 40 каленаў). Здольныя да пераймання і імітацыі галасоў жывёл. Спяваюць амаль усю ноч, першыя 2 тыдні — і днём. Часам у род С. уключаюць да 10 відаў, у т.л. *варакушку, заранак*, С.-свістуна, С. тугайнага, сіняга С., чырванашыек. На Беларусі — С. звычайны.

Даўж. С. звычайнага да 19 см, маса да 30 г. Апярэнне рыжавата-аліўкава-шэрае. Кормяцца С. насякомымі, павукамі, чарвямі, зрэдку ягадамі і насеннем. Адкладваюць 4—6 яец.

САЛАЎЯ́НЕНКА Анатоль Барысавіч (25.9.1932, г. Данецк, Украіна — 29.7.1999), украінскі спявак (лірыка-драм. тэнар). Нар. арт. СССР (1975). Скончыў Данецкі політэхн. ін-т (1954), Кіеўскую кансерваторыю (1978). У 1965—93 саліст Украінскага т-ра оперы і балета. Валодаў прыгожым голасам шырокага дыяпазону. Выканаўчай манеры ўласцівы шчырасць, задушэўная цеплыня, эмацыянальная ўзнёсласць. Сярод партый: Андрэй («Запарожац за Дунаем» С.Гулак-Арцямоўскага), Пятро («Наталка Палтаўка» М.Лысенкі), Ленскі («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Самазванец («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Альфрэд, Герцаг, Манрыка («Травіята», «Рыгалета», «Трубадур» Дж.Вердзі), Фауст («Фауст» Ш.Гуно) і інш. У канцэртным рэпертуары рамансы, рус. і ўкр., неапалітанскія песні. Ленінская прэмія 1980. Нац. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1997.

Літ.: Терещенко А.К. Анатолий Соловьяненко. 2 изд. Киев, 1988; Сташевский Ю.А. Анатолий Соловьяненко: Творческий портрет. М., 1984. *Л.А.Шымановіч.*

САЛА́Х-АД-ДЗІН, Саладзін, Юсуф ібн Айюб (1138—4.3.1193), султан Егіпта [1171—93]. Курд па паходжанні. Быў спачатку на службе сірыйскага султана Нур-ад-дзіна, у 1164—68 удзельнік паходаў у Егіпет. З 1169 візір — фактычны правіцель Егіпта пры намінальнай уладзе халіфа з дынастыі Фатымідаў. Пасля смерці апошняга з Фатымідаў абвясціў сябе султанам Егіпта. У 1174 падпарадкаваў сабе Сірыю і некат. раёны Ірака. У 1187 пачаў вайну супраць дзяржаў крыжаносцаў на Б. Усходзе, разбіў іх войскі 3—4.7.1187 у бітве пры Хіціне. 2.10.1187 заняў Іерусалім, што выклікала 3-і крыжовы паход (1189—92, гл. ў арт. *Крыжовыя паходы*). Вёў вайну з войскам крыжаносцаў на чале з англ. каралём *Рычардам I*. Пасля паражэння свайго войска пры Арсуфе ў вер. 1191 заключыў з Рычардам мірны дагавор, паводле якога захаваў б.ч. сваіх завяванняў, у т.л. Іерусалім. У зах.-еўрап. л-ры вобраз С. часта ўжываўся як прыклад высакароднасці і дабрадзейнасці.

САЛА́ХАЎ Таір Тэймур аглы (н. 29.11.1928, Баку), азербайджанскі жывапісец. Нар. маст. СССР (1973). Правадз. чл. АМ СССР (1975). Герой Сац. Працы (1989). Ганаровы прэзідэнт Міжнар. арг-цыі пластычных мастацтваў пры ЮНЕСКА (з 1973). Скончыў Азерб. маст. вучылішча ў Баку (1950) і Маскоўскі маст. ін-т імя В.Сурыкава (1957). У 1963—74 выкладаў у Азерб. ін-це мастацтваў імя М.А.Аліева ў Баку (з 1973 праф.), з 1975 — у Маскоўскім маст. ін-це. З 1973 1-ы сакратар Саюза мастакоў СССР. У 1950—60-я г. працаваў у рэчышчы т.зв. суровага стылю, творы вызначаліся манументальнасцю графічна дакладных форм, строгай рытмізаванасцю кампазіцыі, напружанасцю, часта кантрастнасцю каларыту: партрэты кампазітараў Кара Караева (1960) і Дз.Шастаковіча (1976), жанравыя кампазіцыі «Рамонтнікі» (1961), «Каля Каспія» (1967), «Новае мора» (1970), графічная серыя «Па Апшэроне» (1969) і інш. У 1970—90-я г. рабіў падкрэслена пластычныя, востра выразныя кампазіцыі («Партрэт Фаці», 1988, і інш.). Аформіў спектаклі «Антоній і

1

2

Салаўі: 1 — звычайны; 2 — заходні.

Клеапатра» (1964, Дзярж. прэмія Азербайджана імя Ахундава 1965) і Гамлет (1970) У.Шэкспіра, «Кёр-аглы» У.Гаджыбекава (1975) у Азерб. акад. драм. т-ры імя Азізбекава ў Баку. Дзярж. прэмія СССР 1968. Дзярж. прэмія Азербайджана 1970.

Літ.: Наджафов М. Т. Салахов. Баку, 1981.

Т.Салахаў. Партрэт кампазітара Кара Караева. 1960.

САЛА́ШЫ (Szálasi) Ферэнц (6.1.1897, г. Кошыцы, Славакія — 12.3.1946), венгерскі паліт. дзеяч. У 1925—35 афіцэр Ген. штаба (з 1932 маёр). У 1935 заснаваў праварадыкальную «Партыю волі нацыі» (забаронена ўладамі ў крас. 1937). У 1938—40 зняволены па абвінавачанні ў дзейнасці супраць урада М.*Хорці*. З 1940 лідэр прафаш. партыі «Скрыжаваныя стрэлы» (гл. *Нілашысты*). Са жн. 1944 пры падтрымцы ням. фашыстаў разгарнуў падрыхтоўку да захопу ўлады, каб не дапусціць выхаду Венгрыі з 2-й сусв. вайны. З 16.10.1944 да 27.3.1945 узначальваў уладу («правадыр нацыі») на частцы тэр. Венгрыі, занятай ням.-фаш. войскамі. У 1946 нар. судом Венгрыі прыгавораны да пакарання смерцю як ваен. злачынца.

САЛАШЁНКА Уладзімір Іванавіч (н. 22.3.1927, с. Ніжняе Старадубскага р-на Бранскай вобл., Расія), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1985), праф. (1986). Засл. работнік культуры Беларусі (1981). Скончыў БДУ (1957). З 1962 у Магілёўскім машынабудаўнічым ін-це (у 1977—88 заг. кафедры філасофіі і навук. камунізму, у 1989—91 дэкан ф-та грамадскіх дысцыплін, з 1992 праф. кафедры гуманітарных дысцыплін). Даследуе гісторыю паліт. партый у Беларусі.

Тв.: Из истории распространения марксизма в Белоруссии (1883—1904 гг.). Мн., 1963; От народничества к марксизму: Распространение марксизма и образование социал-демокр. орг-ций в Белоруссии. Мн., 1971; Большевики в борьбе с мелкобуржуазными партиями в Белоруссии (1903 — март 1917 гг.). Мн., 1981.

САЛВАДО́Р (Salvador), Сан-Сальвадор, Баія, горад на ПнУ Бразіліі, на беразе зал. Тодуз-ус-Сантус Атлантычнага акіяна. Адм. ц. штата Баія. Засн. партугальцамі ў 1549, да 1763 — адм. ц. каланіяльнай Бразіліі. Больш за 2,2 млн. ж. (2000). Марскі порт (вываз какавы, кавы, тытуню, цукру, каштоўнай драўніны). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: хім., харчасмакавая, тэкст., гарбарна-абутковая, дрэваапрацоўчая. У прамысл. прыгарадах — нафтаперапр., нафтахім., маш.-буд. прам-сць, чорная металургія. 2 ун-ты. Маст. і інш. музеі. Шматлікія архіт. помнікі 16—18 ст.: палацы, сабор, кляштары і інш. Гіст. цэнтр С. ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

САЛДА́Т (ням. Soldat ад італьян. soldo манета; жалаванне), 1) першае (малодшае) воінскае званне ў арміях многіх дзяржаў; катэгорыя ваеннаслужачых і ваеннаабавязаных у званнях *радавы*, *яфрэйтар* і інш. ва ўзбр. сілах шэрагу дзяржаў, у т.л. Беларусі. З 15 ст. ў Італіі С. наз. воінаў-наёмнікаў, якія атрымлівалі жалаванне за службу. У Рас. імперыі назва С. пашырылася ў 17 ст., існавала (з перапынкамі) да 1917. У Сав. Арміі катэгорыя «С.» уведзена ў 1946 (з 1918 да 1946 С. наз. чырвонаармейцамі). 2) У шырокім сэнсе С. — баец, воін, ваенны чалавек (у любым званні і ўзросце), які захоўвае адпаведны менталітэт і выпраўку (напр., стары С.), а таксама партызан (лясны С.) і інш. 3) У пераносным сэнсе — удзельнік якой-н. арг-цыі або грамадскага руху, які прысвяціў сябе іх мэтам і задачам або пэўнай справе (напр., С. партыі, рэвалюцыі, супраціўлення і інш.).

САЛДА́ТАЎ Уладзімір Сяргеевіч (н. 19.5.1937, г. Смаленск, Расія), бел. фізікахімік. Акад. Нац. АН Беларусі (1984, чл.-кар. 1977), д-р хім. н. (1970), праф. (1972). Скончыў БДУ (1959). З 1959 у Ін-це агульнай і неарган. хіміі АН Беларусі (з 1966 заг. лабараторыі). З 1981 дырэктар і заг. лабараторыі Ін-та фізіка-арган. хіміі Нац. АН Беларусі, адначасова ў 1988—92 віцэ-прэзідэнт АН Беларусі. Навук. працы па тэорыі іоннага абмену і тэрмадынаміцы іонаабменных раўнавag, даследаванні іонаабменных працэсаў у многакампанентных сістэмах. Распрацаваў агульныя прынцыпы, тэхналогію атрымання і рэгенерацыі *іанітнай глебы*, тэарэт. асновы атрымання палімерных мембран зададзенай структуры і спосабы іх выкарыстання для ачысткі газаў і вадкасцей ад мікрачасцінак і бактэрый. Стварыў мікрафільтры тонкай ачысткі тэхн. асяроддзя для вытв-сці інтэгральных мікрасхем. Прэмія Ленінскага камсамола 1971. Дзярж. прэмія Беларусі 1980.

Тв.: Простые ионообменные равновесия. Мн., 1972; Ионитные почвы. Мн., 1978 (разам з Н.Р.Пёрышкінай, Р.П. Харошка); Ионообменные равновесия в многокомпонентных системах. Мн., 1988 (разам з В.А.Бычковай).

САЛДА́ТКІН Міхаіл Цімафеевіч (10.11.1919, в. Сасноўка Ульянаўскай вобл., Расія — 17.12.1987), бел. вучоны ў галіне цеплазабеспячэння і вентыляцыі. Д-р тэхн. н., праф. (1973). Засл. будаўнік Беларусі (1980). Скончыў Горкаўскі інж.-буд. ін-т (1948). З 1953 у БПІ (з 1960 прарэктар, з 1972 заг. кафедры). Навук. працы па тэрмаапрацоўцы бетону, панэлей, па даследаванні фільтрацыі паветра і цеплафіз. параметраў буд. матэрыялаў.

Тв.: Разлік фільтрацыі паветра праз керамзітабетонныя матэрыялы (разам з В.Д.Акельевым) // Весці АН БССР. Сер. фіз.-энергет. навук. 1968. № 3; Анализ существующих путей выбора режимов тепловой обработки бетонных изделий // Отопление, вентиляция и строительная теплофизика. 1973. Вып. 2.

САЛДА́ЦКІЯ КАМІТЭ́ТЫ, армейскія камітэты, выбарныя органы ў расійскай арміі (ад франтавых да ротных) у 1917—18. Узніклі ў ходзе Лют. рэвалюцыі 1917 у адпаведнасці з загадам № 1 Петраградскага Савета ад 1(14).3.1917. У сак.—маі 1917 у дзеючай арміі ўзнікла каля 50 тыс. С.к., якія кантралявалі выкарыстанне зброі, вырашалі пытанні ўмацавання дысцыпліны, гасп., культ.-асв. і інш. (рашэнні зацвярджаліся адпаведным начальнікам); у іх склад уваходзілі таксама афіцэры і ваен. чыноўнікі. Паводле характару дзейнасці С.к. былі аднатыпныя з Саветамі рабочых, салдацкіх і сял. дэпутатаў, дзейнічалі ў кантакце з імі, удзельнічалі ў мясц. і Усерас. з'ездах Саветаў. Да восені 1917 у С.к. панавалі меншавікі і эсэры, пасля задушэння *Карнілава мяцяжу 1917* — бальшавікі. У ходзе *Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917* да С.к. перайшла ўся паўната ўлады ў войсках. Скасаваны вясной 1918 пры роспуску старой рас. арміі.

САЛДА́ЦКІЯ ПЕ́СНІ, гл. ў арт. *Рэкруцкія і салдацкія песні*.

САЛЕ́ (араб. Сла, Сала), горад у Марока, на Атлантычным узбярэжжы, у вусці р. Бу-Рэгрэг; уваходзіць у склад сталічнай агламерацыі г. Рабат. Засн. ў 11 ст. Каля 500 тыс. ж., у агламерацыі каля 1,5 млн. ж. (2000). Марскі порт. Трансп. вузел. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: харч. (кансервавая, мукамольная, алейная) і дрэваапрацоўчая. Саматужная вытв-сць дываноў і ганчар-

ных вырабаў. Сярэдневяковыя сцены са шматлікімі брамамі. Вялікая мячэць (11—12 ст.), медрэсэ Абу-ль-Хасана і Бу-Інанія (14 ст.).

САЛЕ́ЕЎ Вадзім Аляксеевіч (н. 27.5.1939, С.-Пецярбург), бел. філосаф, культуролаг, маст. крытык. Д-р філас. н. (1992), праф. (1994). Засл. дз. культ. Беларусі (2000). Скончыў БДУ (1962). З 1970 у БПА. З 1995 гал. рэдактар часопіса «Асновы мастацтва», адначасова з 1996 заг. аддзела Нац. ін-та адукацыі Беларусі. Навук. працы па праблемах слав. і бел. культур, эстэтыкі, філас. адукацыі, тэорыі мастацтва, маст. крытыкі, эстэт. і маст. выхавання. Распрацоўвае канцэпцыі развіцця нац. культуры, маст. адукацыі і эстэт. выхавання дзяцей і моладзі на Беларусі, методыку артстрэстэрапіі і артстрэспедагогікі.

Тв.: О художественном вкусе. Мн., 1975; Искусство и его оценка. Мн., 1977; Современная эстетика Белоруссии. Мн., 1979; Нацыянальная самасвядомасць і мастацкая культура. Мн., 1990; Язык в национальной культуре. Мн., 1992; Этническое в художественной культуре. М., 1992; Этнапедагогіка і эстэтычнае развіццё асобы. Мн., 1994; Эстетическое восприятие и детская фантазия. Мн., 1999 (разам з В.У.Івашкевіч).

Г.А.Фатыхава.

САЛЕНАІДА́ЛЬНАЕ ПО́ЛЕ, вектарнае *поле*, дзе адсутнічаюць крыніцы (*дывергенцыя* такога поля ў кожным пункце прасторы роўная нулю). Напр., *магнітнае поле*. Для вектара $\vec{a}$, які ўтварае С.п., можна запісаць $\vec{a} = \mathrm{rot}\vec{v}$ (гл. *Ротар вектарнага поля*), дзе вектар $\vec{v}$ наз. вектарным патэнцыялам С.п.

САЛЕ́НІК Карп Трафімавіч (7.6.1811, г. Лепель Віцебскай вобл. — 19.10.1851), украінскі акцёр, адзін з заснавальнікаў укр. рэаліст. т-ра 1-й пал. 19 ст. Вучыўся ў Віленскім ун-це. Дэбютаваў у 1832 у Харкаве, працаваў таксама ў Кіеве, Адэсе і інш. гарадах, у т.л. ў 1833—43 у рус.-ўкр. трупе Л.Млаткоўскага. Асаблівага поспеху дасягнуў як выканаўца камічных роляў, найперш ва ўкр. рэпертуары. Яго творчасць высока цанілі М.Шчэпкін (неаднаразова быў яго сцэн. партнёрам), М.Гогаль, Т.Шаўчэнка. Сярод лепшых роляў: Выбарны і Возны, Чупрун («Наталка Палтаўка», «Маскаль-чараўнік» І.Катлярэўскага), Шальменка, Стэцька («Шальменка-дзяншчык» і «Шальменка — валасны пісар», «Сватанне на Ганчароўцы» Р.Квіткі-Аснаўяненкі), Фамусаў («Гора ад розуму» А.Грыбаедава), Хлестакоў, Восіп і Бобчынскі, Качкароў («Рэвізор», «Жаніцьба» М.Гогаля), Блазан («Кароль Лір» У.Шэкспіра).

Літ.: Грін А.А. К.Т.Соленик. Київ, 1963.

Р.Я.Піліпчук.

САЛЕНО́ІД (ад грэч. sōlēn трубка + eidos выгляд), згорнуты ў спіраль (шпулю) ізаляваны праваднік, па якім працякае эл. ток. Мае значную *індуктыўнасць* і малыя актыўнае супраціўленне і электраёмістасць. У сярэдзіне поласці С., даўжыня якога значна большая за дыяметр, магн. поле аднароднае і накіравана ўздоўж восі С., яго напружанасць прапарцыянальная сіле току і (набліжана) колькасці віткоў. Знешняе магн. поле С. падобнае да магн. поля стрыжнёвага *магніта*. С. з жал. асяродкам ва ўнутр. поласці наз. *электрамагнітам*. Выкарыстоўваецца як засяроджаная індуктыўнасць у электра- і радыётэхніцы і інш.



Магнітнае поле **саленоіда**.

САЛЕНЦІ́НА (Salentina), Апулія, паўвостраў на ПдУ Італіі, ч. Апенінскага п-ва. Абмываецца Адрыятычным і Іанічным морамі і пралівам Отранта. Даўж. каля 150 км. Узгорыстая раўніна выш. да 300 м. Складзена пераважна з вапнякоў і даламітаў, развіты карст. Міжземнаморская расліннасць. Вінаградарства, тытуняводства. Парты: Таранта, Брындызі.

САЛЕ́РНА (Salerno), горад на Пд Італіі. Адм. ц. прав. Салерна. Каля 200 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт у Салернскім зал. Тырэнскага мора. Прам-сць: маш.-буд., металургічная, хім., тэкст., харчасмакавая (тытунёвыя і макаронныя ф-кі), буд. матэрыялаў. Ун-т. Арх. помнікі: рэшткі замка (8 ст.) і акведука (11—13 ст.), сабор 11 ст. Прыморскі курорт. Салернская мед. школа (з 9 ст.; першая свецкая мед. школа ў Еўропе).

САЛЕ́ТРЫ (сярэдневяковае лац. sal nitri ад лац. sal соль + nitrum прыродная сода, шчолач), агульная гіст. назва нітратаў натрыю $NaNO_3$ (натрыевая С.), калію KNO_3 (калійная С.), амонію NH_4NO_3 (аміячная С.), кальцыю $Ca(NO_3)_2$ (кальцыевая С.), барыю $Ba(NO_3)_2$ (барыевая С.). Натрыевая (найб. пашырана) і каліевая С. трапляюцца ў выглядзе прыродных пакладаў, аднак атрымліваюць С. пераважна хім. шляхам. Выкарыстоўваюць як угнаенні (гл. *Азотныя ўгнаенні*), кампаненты піратэхн. саставаў, выбуховых рэчываў і інш. Гл. таксама *Нітраты, Амонію злучэнні, Барыю злучэнні, Калію злучэнні.*

САЛЕХА́РД, горад, цэнтр Ямала-Ненецкай аўт. акругі Цюменскай вобл. ў Расіі. Засн. ў 1595. Да 1933 Абдорск. 32 тыс. ж. (1999). Рачны порт на р. Палуй пры ўпадзенні яе ў р. Об, каля Паўн. палярнага круга. На процілеглым беразе р. Об — чыг. станцыя Лабытнангі. Аэрапорт. З-ды: рыбакансервавы, малочны; домабуд. к-т. Дрэваапр. прам-сць. Краязн. музей. Цэнтр геолагаразведачных экспедыцый.

САЛЕЦЫ́ЗМ [грэч. soloikismos ад назвы г. Солы (Soloi), грэч. калоніі ў М. Азіі, жыхары якой дрэнна гаварылі па-атычнаму], 1) у паэтыцы — няправільны моўны зварот, свядома выкарыстаны для стварэння «нізкага» стылю. Адрозніваюць віды С.: *плеоназм*, эналага, *эліпсіс, анакалуф*. 2) У лінгвістыцы — сінтакс. памылка ў дапасаванні, кіраванні, парадку слоў, ужыванні дзеепрыметных і дзеепрыслоўных зваротаў, будове складаных сказаў і інш. Напр.: «Добрае надвор'е спрыяла для правядзення ўборачных работ» (замест «Добрае надвор'е спрыяла правядзенню ўборачных работ»), «Прыйшоўшы на працу, у мяне забалела галава» (замест «Калі я прыйшоў на працу, у мяне забалела галава»). Сінтакс. памылкі часта ўзнікаюць пад уплывам мясц. гаворак або інш. моў. Напр.: «Суседзі прыехаўшы» (замест «Суседзі прыехалі»).

І.К.Германовіч.

САЛЁНЫЯ АЗЁРЫ, тое, што *мінеральныя азёры*.

САЛЖАНІ́ЦЫН Аляксандр Ісаевіч (н. 11.12.1918, г. Кіславодск, Расія), рускі пісьменнік. Акад. Рас. АН (1997). Скончыў Растоўскі ун-т, Маскоўскі ін-т філасофіі, л-ры і гісторыі (абодва 1941). У 1945 арыштаваны, да 1953 у лагерах, да 1956 у ссылцы. У 1956 рэабілітаваны. У 1974 пазбаўлены сав. грамадзянства, жыў у Швейцарыі, з 1976 у ЗША. У 1994 вярнуўся ў Маскву. Друкуецца з 1962. У аповесці «Адзін дзень Івана Дзянісавіча» (1962), апавяданні «Матронін двор» (1963, абодва апубл. А.Твардоўскім у час. «Новый мир»), аповесці «У крузе першым» (1968) захаванне чалавечай душы ва ўмовах жорсткай рэчаіснасці. Гал. тэма аповесці «Ракавы корпус» (1968, апубл. за мяжой) — барацьба чалавека са смерцю. Аўтар рамана «Архіпелаг ГУЛАГ» (1973, апубл. за мяжой; Дзярж. прэмія Расіі 1990). У цыкле гіст. раманаў «Чырвонае кола» (т. 1—10, 1971—91) на вял. фактычным

У.С.**Салдатаў**.

А.І.**Салжаніцын**.

матэрыяле разглядаюцца прычыны рэвалюцыі (слабасць улады, упадак рэлігіі, грамадскі радыкалізм) і яе ход, аналізуюцца паліт. і ідэалагічныя платформы розных партый і груп, абгрунтоўваецца магчымасць альтэрнатыўнага гіст. развіцця Расіі. Нарысы грамадскага і літ. жыцця 1960 — пач. 1970-х г. у кн. «Бадалася цяля з дубам» (1975, дапоўненае выд. 1991). Важныя праблемы грамадскага жыцця ўзнімае ў публіцыстыцы («Ліст да правадыроў Савецкага Саюза», «Раскаянне і самаабмежаванне як катэгорыі нацыянальнага жыцця», абодва 1973; «Як нам уладкаваць Расію», 1990; «Рускае пытанне» к канцу XX ст.», 1994, і інш.). Аўтар кн. «Дзвесце гадоў разам (1795—1995)» (ч. 1, 2001), п'ес і інш. У творчасці С., які працягвае традыцыі рус. класікі 19 ст., трагічныя лёсы герояў асэнсоўваюцца ім у святле маральнага і хрысціянскага ідэалу. У страце духоўных жыццёвых арыенціраў, страце асн. маральных прынцыпаў ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці, і найперш у палітыцы, С. бачыць вытокі крызісу сучаснага жыцця. Аснова гіст. працэсу — у маралі, прытрымліванні дабра. Нобелеўская прэмія 1970.

Тв.: Избр. проза: Рассказы, повесть. М., 1990; Архипелаг ГУЛАГ, 1918—1956: Опыт худож. исслед. Т. 1—3. М.; Мн., 1990—91; Пьесы. М., 1990; «Русский вопрос» к концу XX в. М., 1995; Публицистика. Т. 1—3. Ярославль, 1995—97; Россия в обвале. М., 1998; На изломах: Малая проза. Ярославль, 1998; Протеревши глаза. М., 1999.

Літ.: Нива Ж. Солженицын: Пер. с фр. М., 1992; Мешков Ю.А. Александр Солженицын: Личность. Творчество. Время. Екатеринбург, 1993; Слово пробивает себе дорогу: Сб. статей и док. об А.И.Солженицыне, 1962—1974. М., 1998.

СА́ЛІ (Sully) Томас (19.6.1783, г. Хорнкасл, Вялікабрытанія — 5.11.1872), амерыканскі жывапісец. Вучыўся ў Бостане у Г.Сцюарта (1808) і ў Лондане ў Б.Уэста (1809). Працаваў пераважна ў Філадэльфіі. Пісаў партрэты, якім уласцівы рамант. адкрытасць вобразаў, мяккасць: партрэты маёра Томаса Бідла (1818), Томаса Джэферсана, «Парваны капялюш» (1820), а таксама карціны на тэмы амер. гісторыі («Вашынгтон на беразе Дэлавэра», 1818). Познім партрэтам уласцівы рысы салоннасці («Фані Кэмл у ролі Беатрычэ», 1833) або тэатралізаванага пафасу (партрэт каралевы Вікторыі, 1838).

СА́ЛІВАН (Sullivan), адно з буйнейшых калчадана-поліметалічных радовішчаў свету ў Канадзе (прав. Брыт. Калумбія, каля г. Кімберлі). Адкрыта ў 1892, распрацоўваецца з 1900. Агульныя запасы 44 млн. т руды, з сярэднім утрыманнем волава 4,4%, цынку 6,1%, серабра 35 г/т. Руды пірацінавыя масіўныя і пірацінасфалерыт-галеніт-пірытавыя палосчатыя. Паклады пластавыя ў верхнепратэразойскай дыслацыраванай тоўшчы метамарфізаваных парод. Здабыча падземным спосабам, спадарожна здабываюцца медзь, золата, свінец, кадмій, стыбій і сера.

СА́ЛІВЕН (Sullivan) Луіс Генры (3.9.1856, г. Бостан, штат Масачусетс, ЗША — 14.4.1924), амерыканскі архітэктар; адзін з пачынальнікаў *рацыяналізму*, лідэр т.зв. чыкагскай школы. Вучыўся ў Масачусецкім тэхнал. ін-це ў Кеймбрыджы (1872), наведваў Школу прыгожых мастацтваў у Парыжы (1874). Зазнаў уплыў Г.Х.*Рычардсана*. У 1875—95 працаваў у Чыкага з інж. Д.Адлерам: будынак Аўдыторыума (1886—89) — самая вял. ў ЗША тэатр. зала, заключаная ў абалонку з 10-павярховых карпусоў гасцініцы і офісных памяшканняў, і інш. Распрацаваў новы тып вышыннага будынка, дзе раскрыў спецыфічныя маст.-вобразныя якасці небаскроба з метал. каркаса і ячэйкавай структурай. Выкарыстоўваў верт. цягі, спалучаў строгія плоскасці са складаным крывалінейным арнаментам з чыгуну ў духу

Л.**Салівен**. Уэйнрайт-білдынг у Сент-Луісе. 1890—91.

стылю мадэрн: Уэйнрайт-білдынг у Сент-Луісе (1890—91), Гаранты-білдынг у Буфала (1894—95), будынак фірмы «Карсан-Піры-Скот» у Чыкага (1899—1900). Уласную тэорыю рацыяналізму найб. поўна выклаў у арт. «Вышынны канторскі будынак з мастацкага пункту гледжання» (1896). Стварыў канцэпцыю арган. архітэктуры, пазней развітой яго вучнем Ф.Л.*Райтам*. Творчасць С. паўплывала на развіццё еўрап. функцыяналізму 1920-х г. Аўтар шэрагу літ. прац, у т.л. кн. «Гутаркі ў дзіцячым садзе» (1901—02).

Тв.: Рус. пер. — [Избр. отрывки] // Мастера архитектуры об архитектуре. М., 1972.

І.М.Скварцова.

САЛІВО́Н Інеса Іванаўна (н. 24.12.1937, г. Барысаў Мінскай вобл.), бел. антраполаг. Канд. гіст. н. (1970). Д-р біял. н. (1996). Скончыла Мінскі мед. ін-т (1960). З 1968 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі. Вывучае асн. заканамернасці фарміравання фіз. тыпу стараж. і сучаснага насельніцтва Беларусі ў святле этнагенетычных умоў. У выніку даследавання могільнікаў 18 — пач. 19 ст. ёй складзена буйная краніялагічная калекцыя па бел. насельніцтве. Адзін з аўтараў прац «Нарысы па антрапалогіі Беларусі» (1976, з Л.І.Цягака, А.І.Мікулічам), «Антрапалогія Беларускага Палесся» (1978, з імі ж), «Асновы сучаснай антрапалогіі» (1989, з Цягака), «Асновы антрапалогіі і экалогіі чалавека» (1997, з ёй жа) і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 1998 за цыкл прац па антрапалогіі «Чалавек і яго біякультурная адаптацыя».

Тв.: Фізічны тып беларусаў: Узроставая тыпал. і экал. зменлівасць. Мн., 1994.

САЛІГО́РСК, горад абл. падпарадкавання, цэнтр Салігорскага р-на Мінскай вобл., на беразе Салігорскага вадасховішча. За 132 км на Пд ад Мінска. Канцавая чыг. ст. веткі ад Слуцка, на аўтадарозе Слуцк—Мікашэвічы. 101,9 тыс. ж. (2001).

Засн. ў 1958 як пас. Новастаробінск на месцы в. Вішнёўка Старобінскага р-на Мінскай вобл. ў выніку прамысл. распрацоўкі пакладаў калійных солей і буд-ва калійнага камбіната. З жн. 1959 рабочы пас. С., са снежня 1962 у Любанскім р-не. У 1963—79 уведзены ў эксплуатацыю 4 калійныя камбінаты. З 1963 горад абл. падпарадкавання, з 1965 цэнтр Салігорскага р-на. У 1978 — 60 тыс. жыхароў.

У горадзе працуюць ВА *«Беларуськалій»*, прадпрыемствы лёгкай прам-сці «Калінка» і *Салігорская фабрыка трыкатажнай бялізны* «Купалінка», ліцейнамех. з-д «Універсал», буд. арг-цыя «Салігорскпрамбуд», домабуд. камбінат, прадпрыемства «Шахтаспецбуд». *Салігорскі горна-хімічны тэхнікум*, пед. каледж, 2 ПТВ, 4 б-кі, *Салігорскі краязнаўчы музей*, Палац культуры, Дом культуры. Помнікі Героям Сав. Саюза В.З.Каржу, В.І.Казлову, скульпт. кампазіцыі шахцёрам-першапраходцам і ў гонар заснавання горада.

Горад **Салігорск**. Праспект Міру.

САЛІГО́РСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. Размешчана каля г. Салігорск Мінскай вобл. Створана ў 1967 плацінай у сярэднім цячэнні р. Случ. Пл. 23,1 км^2, даўж. 24 км, найб. шыр. 2 км, найб. глыб. 4,5 м. Аб'ём вады 55,9 млн. м^3. Даўж. берагавой лініі 70 км. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. 40% берагоў — штучныя. У верхняй і сярэдняй ч. берагі нізкія, забалочаныя або ўмацаваныя насыпамі; каля Салігорска выш. іх 1—3 м, у залівах нізкія, забалочаныя. Да затаплення на месцы вадасховішча быў забалочаны тарфяны масіў. Дно выслана торфам, ілам, пяском. Мелкаводдзі (глыб. да 2 м) займаюць каля 40% вадасховішча. Ёсць 4 буйныя залівы. Сярэдні шматгадовы сцёк 288 млн. м^3. Рэгуляванне сцёку сезоннае, аб'ём вады аднаўляецца 4 разы за год. Сярэднегадавая амплітуда вагання ўзроўню вады 1,5 м. Замярзае ў пач. снеж., лёд (таўшчыня да 50 см) трымаецца да канца сакавіка. Моцна зарастае;

раслінnасць (чарот азёрны, маннік вадзяны, аер звычайны, эладэя канадская, рдзесты, раскі і інш.) найб. пашыраны ў верхняй і сярэдняй ч. вадасховішча. Водзяцца плотка, акунь, шчупак, карась залаты, джгір, лешч, язь і інш. Выкарыстоўваецца для забеспячэння вадой прадпрыемстваў ВА «Беларускалій», рэгулявання сцёку р. Случ, абваднення с.-г. угоддзяў. Вакол вадасховішча зона адпачынку. 2 санаторыі-прафілакторыі, лодачная станцыя. Вядзецца кантроль



Салігорскае вадасховішча.

за хім. саставам вады ў сувязі з забруджваннем яе салявымі адваламі са Старобінскага радовішча калійных і каменнай солей.

САЛІГО́РСКАЯ ФА́БРЫКА ТРЫКАТА́ЖНАЙ БЯЛІ́ЗНЫ «Купалінка». Пабудавана ў 1969 (1-я чарга) у г. *Салігорск* Мінскай вобл. як ф-ка бялізнавага трыкатажу. З 1970 дзейнічае 3-я чарга ф-кі, у 1989 пабудаваны дадатковы вытв. корпус. З 1990 наз. Салігорскі трыкат. камбінат, з 1992 — арэндное прадпрыемства «Купалінка», з 1997 — адкрытае акц. т-ва «Купалінка». Асн. прадукцыя (2001): трыкат. бялізна і верхні трыкатаж мужчынскага, жаночага і дзіцячага асартыменту.

САЛІГО́РСКІ ГОРНА-ХІМІ́ЧНЫ ТЭ́ХНІКУМ. Засн. ў 1961 у г. Салігорск як горна-мех. тэхнікум, з 11.9.1962 — горна-хімічны. Спецыяльнасці (2000/01 навуч. г.): горныя машыны і абсталяванне; абагачэнне карысных выкапняў; электраэнергетыка; распрацоўка радовішчаў карысных выкапняў; папярэджанне і ліквідацыя надзвычайных сітуацый; машыны і апараты хім. вытв-сцей і прадпрыемстваў буд. матэрыялаў. Прымае асоб з базавай і сярэдняй адукацыяй. Навучанне дзённае і завочнае.

САЛІГО́РСКІ КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Засн. ў 1976, адкрыты ў 1984 у г. Салігорск Мінскай вобл. Пл. экспазіцыі 310 м^2, больш за 9 тыс. адзінак асн. фонду (2002). Мае 3 залы ў выглядзе шахтавых штрэкаў (мастак А.В.Клязовіч). Сярод экспанатаў каменныя прылады працы 2—1-га тыс. да н.э. з археал. раскопак на тэр. раёна, калекцыі прадметаў матэрыяльнай культуры сялян 19 — пач. 20 ст. (жорны, кросны, церніца, гліняны і драўляны посуд і інш.), нар. ткацтва, інтэр'ер сял. хаты, узоры нар. адзення, матэрыялы пра падзеі грамадз. вайны, калектывізацыю, рэпрэсіі сав. часу, пра мастака і пісьменніка Б.Залескага, прыродазнаўца К.Валасовіча. Экспазіцыя Вял. Айч. вайны прысвечана дзейнасці падполля і партыз. руху на Старобіншчыне, землякам Героям Сав. Саюза А.А.*Жуку*, В.З.*Каржу*, Л.З.*Муравіцкаму*, Дз.С.*Наруцкаму*, А.К.*Стампкоўскай*, героям вайны братам М. і І. *Цубам*. У асобным раздзеле пра гісторыю Салігорска дэманструюцца прылады працы шахцёраў, ўзоры калійных солей. У зале прыроды чучалы птушак, жывёл, калекцыі насякомых рэгіёна. Музей ладзіць выстаўкі мясц. майстроў керамікі, ткацтва, саломапляцення, калекцый прадметаў этнаграфіі і інш. *З.В.Рамановіч.*

САЛІГО́РСКІ РАЁН. Размешчаны на Пд Мінскай вобл. Утвораны 6.1.1965. Пл. 2,5 тыс. км^2. Нас. 41,5 тыс. чал. (2001), гарадскога 25,5%. Сярэдняя шчыльн. 17 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Салігорск*. Уключае г.п. *Старобін* і *Чырвоная Слабада*, 168 сельскіх населеных пунктаў, Старобінскі і Чырвонаслабодскі пасялковыя Саветы, 15 сельсаветаў: Акцябрскі, Гаўрыльчыцкі, Гоцкі, Дамanавіцкі, Доўгаўскі, Зажэвіцкі, Капацэвіцкі, Пагосцкі, Першамайскі, Рожанскі, Хорастаўскі, Чапялёўскі, Чыжэвіцкі, Чырванадворскі, Яскавіцкі.

Тэр. раёна знаходзіцца пераважна ў межах *Прыпяцкага Палесся*, паўн. ч. — на *Цэнтральнабярэзінскай раўніне*. Паверхня ў асн. нізінная, 70% яе на выш. 135—150 м, 30% — на выш. 150—180 м, найвыш. пункт 182 м (на ПнУ ад в. Акцябр). Агульны нахіл з Пн на Пд. Карысныя выкапні: калійныя і каменныя солі, торф, буд. пяскі, пясчана-жвіровы матэрыял, гліны і суглінкі. Сярэдняя т-ра студз. -6,1°С, ліп. 18,1°С. Ападкаў 600 мм за год. Вегетац. перыяд 194 сут. Найб. р. Случ з прытокам Морач, Лань. Салігорскае вадасховішча на р. Случ. Меліярац. каналы: Дамanавіцкі, Крывічынскі, Сівельга, Сітня. Пераважаюць глебы с.-г. угоддзяў: тарфяна-балотныя (29,4%), дзярнова-падзолістыя (28,6%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (20,8%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (13,7%). Пад лесам 42,2% тэр. раёна. Лясы пераважна хваёвыя, чорнаальховыя, бярозавыя, дубовыя. Каля 20% лясоў — штучныя насаджэнні, пераважна хваёвыя. Пад балотамі 2% тэрыторыі. Найб. балоты: Грычына-Старобінскае, Капацэвіцкае. У межах раёна заказнікі мясц. значэння: біял. — Ленінскі, Чырвонаслабодскі, гідралагічны — Святое возера, мікразаказнік па мядзведжай цыбулі (чарамшы) каля в. Савецкая Морач. Ахоўныя тарфянікі: Баравая, Белае балота, Воўчае, Вялікае, Вял. Мох, Вялічкавіцкае, Клініцкае, Лань, Чырвоны Шлях. Помнікі прыроды мясц. значэння: паркі «Лістападавічы» і «Пагост», ельнік «Залужжа» ў Старобінскім лясніцтве, клён вастралісты ў в. Заўшыцы, дуброва ў Яскавіцкім, 2 дубровы і 2 участкі з насаджэннямі дубу чырвонага ў Лістападавіцкім лясніцтвах.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 120,4 тыс. га, з іх асушаных 63,3 тыс. га. На

1.1.2001 у раёне 29 калгасаў, 1 саўгас, 24 фермерскія гаспадаркі, птушкафабрыка «Салігорская», с.-г. прадпрыемства «Зажэвічы». Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, свіна-, птушка- і рыбагадоўлі, бураказводстве. Вырошчваюць збожжавыя і кармавыя культуры, бульбу, цукровыя буракі, лён, агародніну, рапс. Прам-сць: дрэваапр. (спальныя матрацы, мэбля, пружынныя блокі, вырабы з драўніны), паліўная (торфабрыкет), харч. (цэльнамалочныя вырабы, кансервы пладоваагародніннyя, сокі), кааператыўная

(хлебабулачныя і каўбасныя вырабы, безалкагольныя напіткі). Лясгас (піламатэрыялы, паркет), рыбгас «Чырвоная Слабада» (карп). Па тэр. раёна праходзіць чыгунка Салігорск—Слуцк—Асіповічы і аўтадарогі Слуцк—Мікашэвічы, Чырвоная Слабада—Глуск і інш. У раёне 23 сярэднія, 11 базавых, 2 пачатковыя школы, муз. школа, школа мастацтваў, санаторная школа-інтэрнат, дзіцяча-юнацкая спарт. школа, 2 дамы дзіцячай творчасці, рэгіянальны цэнтр прафес. навучання, 8 школ-садкоў, 20 дашкольных устаноў, 3 дамы культуры, 30 клубаў, 11 клубаў-бібліятэк, 6 клубаў сац.-культ. паслуг, 38 б-к, 6 бальніц, 6 амбулаторый, 29 фельч.-ак. пунктаў. Два краязнаўчыя музеі працуюць і баявой славы ў в. Хорастава і Чапялі. Помнікі архітэктуры — Свята-Пакроўская царква (пач. 19 ст.) у в. Чыжэвічы. Выдаецца газ. «Шахцёр».

Г.С.Смалякоў, В.І.Шчэрбін.

САЛІГО́РСКІЯ КАЛІ́ЙНЫЯ КАМБІНА́ТЫ, гл. ў арт. *«Беларускалій»*.

САЛІДА́РНАСЦЬ, сацыяльна-філасофскае паняцце, якое азначае агульнасць інтарэсаў, адзінае разуменне асн. прынцыпаў светапогляду, сумесныя практычныя дзеянні дзеля станоўчага вырашэння важных грамадскіх праблем, сумесную адказнасць за стан дзяржавы і грамадства. Канцэпцыі С. займаюць цэнтр. месца ў сістэме сацыяліст. ідэй, нац. і нацыяналіст. ідэалогіях, ідэйна-паліт. праграмах сац., нац.-вызв., рэфарматарскіх і інш. масавых рухаў, што імкнуцца мабілізаваць энергію людзей і накіраваць яе на дасягненне агульных праграмных ідэй. Паводле франц. філосафа А.Конта, С. з'яўляецца вынікам падзелу працы. Франц. сацыёлаг Э.Дзюркгейм адрозніваў механічную С., характэрную для неразвітых архаічных грамадстваў, і арганічную, характэрную для развітога грамадства з дасканалай сістэмай падзелу працы. С. — цэнтр. катэгорыя рус. філасофіі *народніцтва*, прадстаўнікі якога лічылі С. найважнейшым крытэрыем развіцця грамадства: яе нарастанне прыводзіць да прагрэсу і ўсеагульнага дабрабыту, а зніжэнне выклікае барацьбу за існаванне, беднасць і абвастрэнне сац. канфліктаў (М.А.Бакунін, П.А.Крапоткін, П.Л.Лаўроў, Л.І.Мечнікаў, М.К.Міхайлоўскі і інш.). Вышэйшы сэнс С. народнікі бачылі ва ўзгадненні матэрыяльных і нематэрыяльных інтарэсаў кожнай асобы з яе грамадскімі абавязкамі. Лаўроў, Мечнікаў экстрапаліравалі паняцце С. па-за межы чалавечага грамадства, лічылі яе якасцю ўсяго арган. свету, у якім узаемная падтрымка забяспечвае выжыванне пэўнага віду ў барацьбе з інш. і служыць фактарам яго развіцця. На іх думку, С. у грамадстве разбураецца пад уплывам рыначных адносін, індывідуалізму. Паводле Лаўрова, перадумовай С. з'яўляецца ліквідацыя эканам. канкурэнцыі. Мечнікаў разглядаў С. як гал. фактар гіст. працэсу, а прагрэс у грамадстве звязваў з узроўнем развіцця кааперацыі і паслядоўнай зменай яе форм: паднявольныя саюзы, якія трымаюцца на знешнім прымусе, саступаюць месца падпарадкаваным саюзам, якія залежаць ад падзелу працы; канчатковай і вышэйшай формай кааперацыі з'яўляецца свабодны саюз індывідаў, у якім С. усталёўваецца ў выніку свабоднага волевыяўлення.

Літ.: Лавров П.Л. Философия и социология: Избр. произв. Т. 2. М., 1965; Дюркгейм Э. О разделении общественного труда: Метод социологии: Пер. с фр. М., 1996; Мечников Л.И. Цивилизация и великие исторические реки. Статьи. М., 1995.

В.І.Боўш.

«САЛІДА́РНАСЦЬ» (Solidarność), прафсаюзнае аб'яднанне ў Польшчы, якое сваёй грамадска-паліт. актыўнасцю моцна паўплывала на сістэмную трансфармацыю дзярж. ладу Польшчы ў 1980—90-я г. Узнікла 17.9.1980 у г. Гданьск на хвалі забастовачнага руху як Незалежны самакіравальны прафес. саюз «С.» (старшыня Л.*Валенса*); афіц. зарэгістравана 10.11.1980. У канцы 1980 каля 10 млн. чл. Хутка палітызавалася, ператварылася ў масавы дэмакр. рух рабочых і інтэлігенцыі, скіраваны на процідзеянне камандна-адм. сістэме ў краіне (маральная падтрымка з боку польскай каталіцкай царквы, матэрыяльная — польскіх эміграцкіх арг-цый, зах. прафсаюзаў і дабрачынных фондаў). У час ваен. становішча 1981—83 афіцыйна забаронена (8.10.1982), шэраг дзеячаў «С.» інтэрніраваны. Удзельнік «круглага стала» (люты — крас. 1989) паміж урадам і апазіцыяй. 17.4.1989 зноў легалізавана. Пасля перамогі на выбарах у сейм і сенат (4 і 18.6.1989), прызначэння Т.*Мазавецкага* прэм'ерміністрам (24.8.1989) і выбрання Валенсы прэзідэнтам Польшчы (9.12.1990) стала кіруючай паліт. сілай краіны. У лют. 1991 старшынёй «С.» выбраны М.Кшаклеўскі (у 1995 перавыбраны). У 1996 каля 30 малых партый заснавалі Выбарчую акцыю «С.», што перамагла на парламенцкіх выбарах 21.9.1997, але на выбарах 25.9.2001 не здолела правесці ў сейм ніводнага дэпутата. Кіруючы орган — Усяпольская камісія. Уваходзіць у *Міжнародную канфедэрацыю свабодных прафсаюзаў*.

Літ.: Лойко Л.В. Политическая борьба в Польше (70—80 гг.). Мн., 1995; Часноўскі М.Э. Сістэмныя пераўтварэнні ў Рэспубліцы Польшча (1989—1999). Мн., 2000.

У.Я.Калаткоў.

САЛІДА́РНАЯ АДКА́ЗНАСЦЬ, разнавіднасць грамадзянскай адказнасці па абавязацельстве, у якім некалькі даўжнікоў. Звычайна ўзнікае пры непадзельнасці прадмета абавязацельства, сумесным прычыненні шкоды, а таксама ў выпадках, калі ў дагаворы не ўстаноўлена іншае. У цывільным праве Рэспублікі Беларусь у выпадку С.а. крэдытор мае права патрабаваць выканання ад усіх даўжнікоў сумесна і ад любога паасобна (поўнасцю ці ў частцы доўгу). Калі адзін з даўжнікоў задаволіў патрабаванне крэдытора поўнасцю, то астатнія нясуць перад ім адказнасць у роўных долях. Крэдытор, які не атрымаў поўнага задавальнення ад аднаго з салідарных даўжнікоў, мае права патрабаваць неатрыманае ад астатніх даўжнікоў. Салідарныя даўжнікі застаюцца абавязанымі да таго часу, пакуль абавязацельства не будзе выканана поўнасцю.

Э.І.Кузьмянкова.

САЛІДО́Л (ад лац. solidus шчыльны + oleum масла), пластычны антыфрыкцыйны змазачны матэрыял; найб. пашыраны від *пластычных змазак*. Густая маса цёмна-рудога (амаль чорнага) колеру, $t_{пл}$ 75—90 °С. Не растваральна ў вадзе. Атрымліваюць загушчэннем *індустрыяльнага масла* сярэдняй вязкасці кальцыевым мылам на аснове сінт. тлустых кіслот (сінт. С.) ці тлушчаў (тлушчавы С.). Выкарыстоўваюць у падшыпнікавых вузлах, што працуюць пры т-рах ад -30 да 70 °С.

САЛІКА́МСК, горад у Пермскай вобл. Расіі. Засн. ў 1430. 106 тыс. ж. (2000). Прыстань на р. Кама. Чыг. станцыя. Буйны цэнтр хім. і нафтахім. прам-сці, здабычы і перапрацоўкі калійных солей, вытв-сці калійных і калійна-магніевых угнаенняў, тэхн. солі; цэлюлозна-папяровы камбінат; з-ды: гумава-тэхн. прадукцыі, магніевы, суднарамонтны; дрэваапрацоўчая прам-сць. Пед. ін-т. Краязн. музей. Арх. помнікі 17—19 ст.

САЛІ́М Джавад (1920, г. Анкара — 1961), іракскі жывапісец і скульптар. Вучыўся ў Парыжы (1938), Рыме (1939—40) і Лондане (1946—49). Заснаваў у Багдадзе скульпт. аддзяленне ў Ін-це прыгожых мастацтваў і «Групу сучаснага мастацтва» (1951). Жывапісныя і графічныя творы выконваў у духу мадэрнісцкіх кірункаў. У скульптуры, абапіраючыся на стараж. традыцыі іракскага мастацтва, імкнуўся стварыць своеасаблівы маст. стыль, адметны ўмоўна-абагульненай трактоўкай форм, дэкар.-арнаментальным характарам кампазіцыі. Асн. твор — манум. паню «Рэвалюцыя 14 ліпеня» (1959—60) у Багдадзе.

САЛІ́НАС-ГРА́НДЭС (Salinas Grandes), саланчак на Пн3 Аргенціны. Рэлікт стараж. возера ў тэктанічнай упадзіне. Пл. каля 8,5 тыс. км^2. Змяшчае соду, паташ. Праз С.-Г. пракладзена чыгунка Тукуман—Кордава.

САЛІ́НАС ДЭ ГАРТА́РЫ (Salinas de Gortari) Карлас (н. 1948, Мехіка), дзяржаўны і паліт. дзеяч Мексікі. Скончыў Нац. аўт. ун-т Мексікі. Д-р эканам. навук. З 1966 чл. Інстытуцыйна-рэв. партыі (ІРП). У 1971—74 у мін-ве фінансаў, у 1974—76 кіраўнік эканам. кабінета мекс. ўрада. У 1978—81 ген. дырэктар Упраўлення фін. планавання. У 1981—82 ген. дырэктар Ін-та паліт., сац. і эканам. даследаванняў пры ІРП. У 1982—87 міністр па планаванні і бюджэце. У 1988—94 прэзідэнт Мексікі.

Пачаў ажыццяўленне праграмы эканам. рэформ, але не здолеў дабіцца стабілізацыі эканомікі краіны, што прывяло ў 1993 да фін. крызісу. Пасля заканчэння тэрміну прэзідэнцтва пакінуў Мексіку з-за абвінавачанняў у карупцыі.

САЛІПСІ́ЗМ (ад лац. solus адзін + ipse сам), гранічная форма суб'ектыўнага ідэалізму, паводле якой несумненнай рэальнасцю прызнаецца толькі суб'ект, а аб'ектыўны свет існуе выключна ў свядомасці індывіда. Знаходзіцца ў супярэчнасці з жыццёвым вопытам і штодзённай дзейнасцю чалавека, таму ў завершаным выглядзе сустракаецца надзвычай рэдка (напр., у франц. філосафа і ўрача К.Брунэ). Асобныя рысы С. характэрны для суб'ектыўнага ідэалізму (Дж. Берклі, І.Фіхтэ), *эмпірыякрытыцызму* (Э.Мах), *іманентнай філасофіі* (В.Шупе, Р.Шуберт-Зольдэрн), прадстаўнікі якіх імкнуцца пазбягаць граничных форм С. шляхам сінтэзу суб'ектыўнага і аб'ектыўнага ідэалізму. Тэрмін «С.» выкарыстоўваюць таксама ў этыцы для абазначэння крайняга *эгаізму*, *эгацэнтрызму* ці т.зв. практычнага С. (паводле вызначэння франц. экзістэнцыяліста Г.Марселя). Прадстаўнік практычнага С. — М.Штырнер. *А.Б.Савеня.*

САЛІТО́Н, структурная ўстойлівая адасобленая *хваля* ў нелінейным дыспергавальным асяроддзі. Паводзіць сябе як часціца: пры ўзаемадзеянні паміж сабой ці з інш. ўзбурэннямі асяроддзя С. не разбураюцца, а разыходзяцца з захаваннем сваёй структуры, якая застаецца стацыянарнай за кошт спалучэння нелінейнасці асяроддзя і дысперсіі (гл. *Дысперсія хваль*). Уласцівасці С. ўлічваюцца ў тэорыі кандэнсаваных асяроддзяў, квантавай статыстыцы, тэорыі фазавых пераходаў.

САЛІТЭ́Р (франц. solitaire ад лац. solitarius адзінокі) у садова-паркавым мастацтве, адзіночныя пасадкі дрэў, кустоў або кветкава-дэкар. раслін. Мае самаст. дэкар. значэнне — канцэнтруе ўвагу на дэталях садова-паркавай кампазіцыі.

Салітэрныя дрэвы вызначаюцца памерамі, формай кроны, афарбоўкай, дэкар. кветкамі, пладамі і гарманічна ўпісваюцца ў ландшафт. Найчасцей выкарыстоўваюць святлолюбівыя пароды (хвоя звычайная, бярозы павіслая і яп., лістоўніцы сібірская і еўрап., таполі канадская і пірамідальная, акацыя белая, лох серабрысты, яблыні Нядзвецкага, ягадная і інш.). Кусты С. бываюць у штамбавай (ружы, глог), сцелістай (ядловец казацкі) і інш. формах. Кветкава-дэкар. расліны для С. падбіраюць буйныя, з яркімі і арыгінальнымі кветкамі і лісцем (півоні, вяргіні, астыльбы, хосты, папараці).

САЛІФЛЮ́КЦЫЯ (ад лац. solum глеба + fluctio выцяканне), павольнае спаўзанне глеб і рыхлых грунтоў па схілах у працэсе іх прамярзання і адтавання і пад уплывам сілы цяжару. Адзначаецца на схілах 2—5° і больш, пераважна ў абласцях развіцця шматгадовай мерзлаты і сезоннага прамярзання грунтоў. С. садзейнічаюць актыўнае раставанне снегу і моцныя ліўні. Скорасці спаўзання звычайна складаюць некалькі сантыметраў за год, пры хуткіх зрушэннях на больш стромкіх схілах дасягаюць соцень метраў за гадзіну. С. прыводзіць да ўтварэння спецыфічных форм мярзлотнага рэльефу — саліфлюкцыйных тэрас, валоў, град і інш. На тэр. Беларусі С. была пашырана ў перыяд адступання ледавікоў у антрапагенавы перыяд. У сучасных умовах развіта слаба, дробныя формы С. трапляюцца на схілах Мінскага, Навагрудскага ўзвышшаў, Мазырскай грады, у далінах рэк Зах. Дзвіна, Дняпро, Нёман, Прыпяць і некат. малых рэк.

САЛІЦЁРЫ, сямейства стужачных чарвей, гл. *Цэпні*.

САЛІЦЫ́ЛАВАЯ КІСЛАТА́, 2-гідраксібензойная кіслата, *о*-аксібензойная кіслата, найпрасцейшая араматычная *аксікіслата*; антысептык.



Бясколерныя крышталі, $t_{пл}$ 159,5 °С, шчыльн. 1443 кг/м³. Добра растваральна ў этаноле, дыэтылавым эфіры, мала — у вадзе. Вытворныя С.к. па функцыян. групах — солі і эфіры наз. саліцылатамі. У прыродзе трапляецца ў раслінах пераважна ў выглядзе гліказіду метылавага эфіру. У прам-сці С.к. і яе вытворныя атрымліваюць тэрмічным карбаксіліраваннем сухога феналяту натрыю дыаксідам вугляроду пад ціскам. Выкарыстоўваюць у вытв-сці лек. сродкаў (напр., *ацэтылсаліцылавай кіслаты*, *п*-амінасаліцылавай к-ты — процітуберкулёзнага сродку), пахучых рэчываў (метылсаліцылату, бензілсаліцылату і інш.), як кампанент мазей, паст і растворaў для лячэння скурных хвароб (напр., т.зв. саліцылавы спірт — 2%-ны раствор С.к. ў этаноле, паста Ласара), кансервант у харч. прам-сці, рэагент у аналіт. хіміі.

САЛІ́ЧАСКАЯ ДЫНА́СТЫЯ, гл. ў арт. *Франконская дынастыя*.

САЛІ́ЧАСКАЯ ПРА́ЎДА (Lex Salica), зборнік *звычаёвага права* салічаскіх франкаў; адна з *варварскіх праўд*. Запісана (на лац. вульгаце з франкскімі словамі і выразамі) у пач. 6 ст. па распараджэнні караля Хлодвіга; пры яго пераемніках дапаўнялася і перапрацоўвалася. Падзяляецца на тытулы (главы). Утрымлівала пералік злачынстваў і адпаведных ім пакаранняў (пераважна ў выглядзе штрафаў), розныя этапы суд. працэдуры. Не зведала прыкметнага ўплыву рымскіх праваадносін, захавала амаль у нязменным выглядзе нормы германскага звычаёвага права. Адлюстравала эвалюцыю франкскага грамадства да першабытна-абшчыннага ладу да пач. этапу феад. адносін.

САЛМА́НАЎ Вадзім Мікалаевіч (4.11.1912, С.-Пецярбург — 27.2.1978), расійскі кампазітар, педагог. Нар. арт. Расіі (1972). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1941, кл. М.Гнесіна). З 1945 выкладаў у Муз.-пед. ін-це імя Гнесіных у Маскве, з 1951 — у Ленінградскай кансерваторыі (з 1965 праф.). Сярод твораў паэма-араторыя «Дванаццаць» (1957) і кантата «Скіфы» (1973; абедзве паводле А.Блока); 4 сімфоніі (1952—76), сімф. сюіта «Паэтычныя карцінкі» (1955; паводле Х.К.Андэрсена); 2 канцэрты для скр. з арк. (1964, 1974); 6 стр. квартэтаў (1945—71), рамансы, у т.л. цыкл рамансаў на вершы Я.Купалы «Былыя песні» (1947), песні, музыка да спектакляў драм. т-ра і кінафільмаў. Звяртаўся да жанру хар. канцэрта, у т.л. «Лябёдка» (1970) на нар. тэксты. Дзярж. прэмія Расіі імя М.Глінкі 1970.

Т.Г.Слабодчыкава.

САЛО́ДКА, лакрычнік, лакрыца (Glycyrrhiza), род кветкавых раслін сям. бабовых. Каля 15 відаў. Пашыраны ва ўмераным і субтрапічным паясах Еўразіі, Амерыкі, Паўн. Афрыкі і Аўстраліі. Растуць пераважна ў стэпавай, паўпустыннай і пустыннай зонах. На Беларусі інтрадукаваны С.: бледнакветкавая (G.pallidiflora), голая (G.glabra), пахучая (G.foetidissima), уральская (G.uralensis) і інш.

Салодка голая.

Шматгадовыя травяністыя расліны выш. да 2 м. Карэнішчы патоўшчаныя. Сцёблы прамастойныя, галінастыя, голыя ці апушаныя. Лісце непарнаперыстае, часта клейкае. Кветкі лілаватыя, у пазушных гронках. Плод — боб. Салодкавы, або лакрыцавы, корань (карэнішчы і карані) мае ў сабе гліказіды, флаваноіды, цукрозу, эфірны алей, мінер. солі і інш. З яго атрымліваюць экстракты (састаўная ч. піва, квасу і інш.), сіропы для кандытарскай вытв-сці, выкарыстоўваюць як смакавую, антыаксідантную, бактэрыцыдную і фунгіцыдную дабаўку для лекаў, у ежу і напоі; таксама для вырабу фарбаў, дублення скуры і інш. З надземных ч. расліны атрымліваюць жоўтую фарбу для шэрсці і шоўку, са сцёблаў вырабляюць вяроўкі, грубую пражу, шчоткі, лісце — сурагат чаю. Лек., харч., тэхн., кармавыя і меданосныя расліны. *В.М.Прохараў.*

САЛО́ДКАЯ Святлана Аляксандраўна (н. 7.12.1958, в. Дудзічы Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. спявачка (лірычнае сапрана). Засл. арт. Беларусі (1990). Жонка У.І.*Салодкага*. Скончыла Баранавіцкае муз. вучылішча (1978). З 1978 салістка Дзярж. нар. хору Беларусі, з 1985 — ансамбля нар. музыкі «Свята» і Дзярж. ансамбля танца Беларусі, адначасова спявае ў дуэце з Салодкім, захоўваючы арыгінальную нар. манеру выканання. З 1994 адна са стваральніц і салістка ансамбля нар. песні «Вяселле». Валодае яркім голасам сакавітага тэмбру, выкананню ўласцівы выразнасць, задушэўнасць. У рэпертуары пададзеныя ў рэгіянальных традыцыях спеваў бел. нар. песні, у т.л. «Пасею гурочкі», «Грачанікі», «А й на дварэ дробен дождж ідзе» (вясельная). Сярод бел. нар. песень, выкананых у дуэце, «Цячэ вада ў ярок», «Ой, хадзім, хадзімо», «Ізза лісу-гаю вода прыбывае». Пра С. і яе мужа зняты кінафільм. Лаўрэат міжнар. фестывалю ў Паўн. Карэі (г. Пхеньян, 1992). *Н.Г.Мазурына.*

САЛО́ДКАЯ БУ́ЛЬБА, тое, што *батат*.

САЛО́ДКАЯ ГАРЭ́ЛКА, у беларусаў і некат. інш. народаў вясельнае абрадавае пітво, якім частавалі сваякоў і бацькоў маладой за захаванне ёй цнатлівасці, маральнай чысціні. Наз. таксама «чырвоная гарэлка», «калінкі», «рожкі». Пасля шлюбнай ночы малады з дружкамі ехалі з бутэлькай С.г. да бацькоў маладой «на падзяку». С.г. рыхтавалі з падсалоджанай мёдам або цукрам і падфарбаванай чырвонымі ягадамі гарэлкі. На Пн Беларусі і ў Латгаліі С.г. варылі адмысловым спосабам у гліняным гаршку з рознымі духмянымі каранямі, кменам, мёдам або цукрам на прыпечку. Бутэльку з С.г. затыкалі галінкамі каліны і сцяблінкамі аўса, абвязвалі каляровым поясам або чырв. стужкай і загортвалі ў вышыты ручнік. Цешча, атрымаўшы яе, частавала маладога яешняй, а сваіх родных — С.г. У некат. рэгіёнах С.г. бралі з сабой бацькі маладой, калі ехалі на *пярэзвы*. *Л.А.Малаш.*

САЛО́ДКІ Уладзімір Іванавіч (н. 1.9.1956, чыг. ст. Галынец Магілёўскага р-на), бел. спявак (барытон). Засл. арт. Беларусі (1990). Муж С.А.*Салодкай*. Скончыў Мінскі ін-т культуры (1985). З 1979 артыст Дзярж. нар. хору Беларусі, з 1984 — ансамбля нар. музыкі «Свята». З 1985 спявае ў дуэце з Салодкай. З 1994 адзін са стваральнікаў і саліст ансамбля нар. песні «Вяселле», з 1996 саліст Дзярж. ансамбля танца Беларусі. Валодае голасам прыгожага тэмбру, шырокага дыяпазону. У рэпертуары бел., рус., укр. нар. песні, а таксама аўтарскія творы, у т.л. «А дзе ж ты, бурлак, валачыўся» (балада), «Чапурушачка», «У лузе каліна стаяла», «Кірыла Тураўскі» (У.Будніка). *Н.Г.Мазурына.*

САЛО́ДЫШАЎ Арцём Іванавіч (5.10.1910, в. Лазаравічы Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 27.1.1960), Герой Сав. Саюза (1945). Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну з 1941 на фронце, з 1943 партызан, камандзір узвода партыз. палка на Магілёўшчыне. З

А.І.**Салодышаў**.

1944 на 2-м Бел. фронце. Камандзір стралк. аддзялення сяржант С. вызначыўся ў баі на Пд ад Магілёва, дзе пасля пераправы цераз Дняпро ў баі за в. Стайкі гранатамі знішчыў дзот. Пасля вайны на гасп. рабоце.

САЛО́МА, сухія сцёблы раслін, што застаюцца пасля малацьбы збожжавых і зернебабовых культур, таксама лёну, канапель і інш., з якіх выдалены лісце, суквецці, насенне. С. збожжавых культур — грубы баластны корм пераважна для буйн. раг. жывёлы ці дабаўка да сакаўных кармоў. Пажыўная каштоўнасць невял. — клятчаткі 35—45%, мала пратэіну (3—4%), мінер. рэчываў, вітамінаў. Для паляпшэння пажыўнасці С. здрабняюць, запарваюць, сіласуюць, апрацоўваюць хім. рэчывамі. Выкарыстоўваюць таксама на подсціл жывёле, у цэлюлознай і папяровай прам-сці, для прыгатавання буд. матэрыялаў (саману і саламіту), плеценых вырабаў. С. лёну і канапель — сыравіна для атрымання *тросты*, з якой вылучаюць тэкст. валокны.

САЛОМАСІЛАСАРЭ́ЗКА, машына для рэзкі саломы і здрабнення зялёнай масы пры падрыхтоўцы кармоў і нарыхтоўцы *сілосу*. Бываюць барабанныя (звычайна стацыянарныя, з прыводам ад электрарухавіка) і дыскавыя (перасоўныя, з прыводам ад трактара або электрарухавіка).

Рэжучы апарат працуе па прынцыпе нажніц, адным з лёзаў якіх з'яўляюцца вярчальныя нажы (на барабане або дыску), другім — лязо нерухомай процірэжучай пласціны. С. ўстанаўліваюць каля сіласных збудаванняў, у кармацэхах, каля пунктаў нарыхтоўкі саломы на корм або подсціл. Ручныя і конныя С. наз. *сячкарнямі*.

Літ.: Белянчиков Н.Н., Смирнов А.И. Механизация животноводства. 2 изд. М., 1983. *В.М.Кандрацьеў.*

САЛОМАСКЛАДА́ЛЬНІК, капноўшчык, капаклад, навясное ці прычапное прыстасаванне да *збожжаўборачнага камбайна*, прызначанае для складання саломы ў копы. Збірае саломы і мякіну (масу) з саламатрэса і ачысткі камбайна і перыядычна выкідвае



Схема **саломасіласарэзкі**: 1 — электрарухавік; 2 — дыск з лопасцямі; 3 — нож; 4 — грабяні; 5 — дэфлектар; 6 — сілкавальныя вальцы; 7 — падпрасоўвальны транспарцёр; 8 — падавальны транспарцёр.

сабраную капу на ржышча ці ў копазбіральнік. У механізаваных С. камера запаўняецца салома- і мякінанабівальнікамі, якія падпрасоўваюць масу ў камеры; у немеханізаваных маса паступае непасрэдна з саламатрэса і ачысткі камбайна. *В.М.Кандрацьеў.*

САЛО́МІНЫ, расійскія акцёры, браты. Нарадзіліся ў г. Чыта (Расія). Юрый Мяфодзьевіч (н. 18.6.1935). Нар.

Да арт. **Саломіны**. Юрый Мяфодзьевіч і Віталь Мяфодзьевіч.

арт. Расіі (1974). Нар. арт. СССР (1988). Чл.-кар. Рас. акадэміі адукацыі (1992). Праф. Тэатр. вучылішча імя М.Шчэпкіна (1986). Скончыў Тэатр. вучылішча імя Шчэпкіна (1957). З 1957 ў Малым т-ры (з 1988 маст. кіраўнік). У 1990—91 міністр культуры Расіі. Ігра адметная глыбокім драматызмам пры мяккасці, лірычнасці акцёрскай манеры: Сірано («Сірано дэ Бержэрак» Э.Растана), Пратасаў («Жывы труп» Л.Талстога), Мікалай II («... і Аз ваздам» С.Кузняцова) і інш. Займаецца рэжысурай. Зняўся ў фільмах: «Бяссонная ноч» (1960), «Вясна на Одэры» (1968), «Чырвоная палатка» (1970, СССР—Італія), «Дэрсу Узала» (1976), «Блуканне па пакутах» (1977), «Крык цішыні» (1982), «Ад'ютант яго правасхадзіцельства» (1970, Дзярж. прэмія Расіі, 1971), «ТАСС упаўнаважаны заявіць», «Тайна вілы «Грэта» (абод-

ва 1984), «Прывал вандроўнікаў» (1991), «У пачатку было слова», «Сны пра Расію» (абодва 1992) і інш. Віталь Мяфодзьевіч (н. 12.12.1941). Нар. арт. Расіі (1992). Скончыў Тэатр. вучылішча імя Шчэпкіна (1963). У 1963—85 і з 1988 у Малым т-ры. Пераважна характарны акцёр, надзелены драм. талентам. Камед. ролям уласцівы вытанчанасць, лёгкасць, імпульсіўнасць: Чацкі («Гора ад розуму» А.Грыбаедава), Фіеска («Змова Фіескі ў Генуі» Ф.Шылера), Хлестакоў («Рэвізор» М.Гогаля) і інш. З 1963 здымаецца ў кіно: «Жанчыны» (1966), «Старэйшая сястра» (1967), «Салют, Марыя!» (1971), «Сібірыяда» (1979), «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана» (1979—83), «Сільва» (1981), «Пікавая дама» (1982), «Вяртанне з арбіты» (1984), «Чалавек, які закрыў горад» (1983), «Зімовая вішня-1» (1985), «Ён, яна і дзеці» (1986), «Зімовая вішня-2» (1990), «Чорны квадрат» (1992), «Зімовая вішня-3» (1995) і інш.

Літ.: Москалева И. Ю.Соломин. М., 1974; Закржевская Л. В.Соломин. М., 1979.

САЛО́МКА МАСТА́ЦКАЯ, плеценыя мастацкія вырабы з саломы; від *народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*. Вядома ў многіх земляробчых народаў Еўропы, на Беларусі пашырана з даўніх часоў. З саламяных жгутоў, перавітых лазой, выраблялі разнастайныя ёмістасці для збожжа, мукі, адзення, каштоўных рэчаў, а таксама пчаліныя вуллі (саламянікі). Іх маст. аблічча ствараласа выразнымі формамі, своеасаблівым дыяганальным дэкорам, утвораным кантрастным спалучэннем карычневых дубцоў з залацістымі жгутамі саломы. Унікальная з'ява ў сусв. мастацтве — выкарыстанне саломы ў вырашэнні манум.-дэкар. задач, для аздаблення інтэр'ераў палескіх цэркваў, пераважна іканастасаў. Захаваліся іх фрагменты — царскія вароты канца 18 — пач. 19 ст. з вёсак Лемяшэвічы Пінскага р-на і Вавулічы Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл., усе арнаментальныя матывы якіх цалкам сплецены з саломы і замацаваны на драўляных каркасах. Аснова іх дэкору — традыц. вітая пляцёнка і тарохгранныя плоскія і выпуклыя ўстаўкі. У такой жа тэхніцы выраблялі шкатулкі, куфэркі, фруктоўніцы і інш. Са стужак, сплеценых з 4—8 саломінак, сшывалі *брылі*. Магічную і дэкар. ролю ў сял. хатах выконваў *павук*, своеасаблівая кінетычная прасторавая канструкцыя з саломінак, якую падвешвалі да столі ў покуці. З саламяных пучкоў, часам з дабаўленнем нітак, стужак, абрэзкаў тканін плялі аграрна-абрадавую атрыбутыку ў выглядзе фігур чалавека, жывёл, птушак, дзіцячыя цацкі, вырабы дэкар. пластыкі (жаваранкі, галубы, лялькі, коні і інш.). Яны вызначаліся абагульненымі, умоўнымі формамі, адсутнасцю дэкору. У сярэдзіне 20 ст. з заняпадам ручнога жніва традыцыі многіх відаў пляцення з саломы сталі забывацца. С.м. адрадзілася ў 1960-я г. для стварэння сувенірных і маст. вырабаў. Выросла іх дэкаратыўнасць, ускладніліся і ўзбагаціліся спалучэннем разнастайных тэхнік пляцення формы, павялічылася жанравая і тэматычная разнастайнасць. Найб. пашырылася саламяная пластыка ў выглядзе фігур жывёл, птушак, людзей, а таксама кампазіцыі і жанравыя сцэнкі на фальк., літ., быт. тэмы. Утылітарна-бытавыя вырабы з саломкі (шкатулкі, куфэркі, фруктоўніцы, кошыкі, хлебніцы і інш.), сувенірную пластыку, галаўныя ўборы, кветкі, біжутэрыю, ёлачныя цацкі выраблюць на фабрыках маст. вырабаў; сярод вядучых майстроў Т.Агафоненка, К.Арцёменка, К.Асташэвіч, Л.Блохава, Л.Главацкая, Г.Іванова, Н.Кузняцова, Л.Лось, Н.Панцялеева, Г. і Я. Саламянкі, Г.Саланінка, В.Салдатава, Г.Сапун, Т.Хадановіч і інш. У 1997 праведзена 1-е Рэсп. свята-конкурс саломапляцення «Саламяны цуд».

Да арт. **Саломка мастацкая**. Царскія вароты. Майстар з в. Вавулічы Драгічынскага раёна Брэсцкай вобл. Канец 18 ст.

Да арт. **Саломка мастацкая**. Г. і Я. Саламянкі. Шкатулка і паднос. 1970-я г.

Да арт. **Саломка мастацкая**. Т.Агафоненка. Конь. 1994.

Літ..: Лобачевская О.А., Кузнецова Н.М. Возьми простую соломку. Мн., 1988; Сахута Я. Народнае мастацтва Беларусі. Мн., 1997; Лобачевская О. Плетение из соломки. [М., 2000]. *Я.М.Сахута.*

САЛО́Н (франц. salon, італьян. salone ад sala зала) у архітэктуры і мастацтве, 1) у 15—17 ст. вялікае парадное памяшканне ў італьян. (пазней і інш. еўрап. краін) палацах, прызначанае для прыёмаў, збораў, канцэртаў і інш. 2) Літ.-маст. гурток, які збіраецца ў прыватным доме. Вядомы ў Францыі з 17 ст. (С. маркізы дэ Рамбуе), у Расіі ў 19 — пач. 20 ст. (С. княгіні З.А.Валконскай у 1-й пал. 19 ст. ў Маскве) і інш. 3) Зала, памяшканне для экспанавання і продажу твораў мастацтва (гл. таксама *Мастацкая галерэя*). 4) Перыядычная публічная выстаўка твораў сучаснага мастацтва. Першая афіц. выстаўка, дзе экспанаваліся творы жывых мастакоў, адбылася ў 1653 у Парыжы па ініцыятыве Каралеўскай акадэміі жывапісу і скульптуры. З 1673 С. ладзіліся пад адкрытым небам, у палацы Пале-Руаяль, з 1699 у Луўры (да 1736 у Вял. галерэі, у 1737—1848 у т.зв. Квадратным С.; адсюль назва), пазней у Вял. палацы, з 1848 у палацы Гран Пале на Елісейскіх палях. Да 1746 адбываліся штогод, пазней раз у 2 гады. Да сярэдзіны 19 ст. былі найб. прадстаўнічай афіц. выстаўкай у Францыі, дзе экспанаваліся творы пераважна чл. акадэміі і т.зв. прызначаных. Майстры, якія не займалі значнага месца ў маст. іерархіі, выстаўлялі свае творы на пл. Дафіна (т.зв. С. маладых) і інш. Арганізацыя С. паўплывала на фарміраванне выставачнай дзейнасці (з'яўленне першых каталогаў, крытычных артыкулаў, маст. журы і інш.). З пач. 19 ст. арганізатары

С. падтрымлівалі руі́ннае акад. мастацтва, варожа ставіліся да наватарства і парушэння традыцый (гл. *Салоннае мастацтва*), што выклікала вострую барацьбу маст. кірункаў і іх супрацьпастаўленне С. З 1881 у веданні Т-ва франц. мастакоў, якое ладзіць штогадовыя «Веснавыя С.» (з 1903 таксама «Восеньскія С.»). З канца 19 ст. ўзнікаюць авангардысцкія выстаўкі, якія таксама маюць назву С. (напр., «С. Незалежных», 1884) і С. ў інш. краінах. У шырокім значэнні — унутр. памяшканне аўтобуса, самалёта, аўтамабіля і пад. для пасажыраў.

САЛО́Н (грэч. Solōn; паміж 640 і 635 — каля 559 да н.э.), афінскі (Стараж. Грэцыя) палітычны дзеяч, рэфарматар. Паходзіў са збяднелага арыстакратычнага роду Кадрыдаў. Пасля абрання ў 594 на пасаду *архонта* ажыццявіў шэраг рэформ у інтарэсах афінскага дэмасу: скасаваў пазыковае рабства, уніфікаваў меры вагі і грашовую сістэму, увёў закон пра свабоду завяшчання і інш. Ранейшы падзел грамадзян паводле родавага паходжання С. замяніў на 4 маёмасныя разрады (філы), якія вызначалі правы і абавязкі грамадзян паводле памераў прыбытку. Усе грамадзяне атрымалі права браць удзел у эклесіі (нар. сход). Заснаваў новы орган кіравання — Раду 400, куды выбіралася па 100 чал. ад кожнай з 4 разрадных філ, і геліэю (суд прысяжных). Рэформы С. сталі важным этапам на шляху ўсталявання афінскай рабаўладальніцкай дэмакратыі. С. — адзін з першых атычных паэтаў. Стараж. грэкі прылічалі яго да «сямі мудрацоў». *А.Г.Зельскі.*

САЛО́НА (Salonae), ілірыйскае паселішча за 5 км на Пн ад г. Спліт (Харватыя). У канцы 2—1 ст. да н.э. апорны пункт рымлян у Далмацыі; у 27 да н.э. атрымала статус рымскай калоніі. Пры *Флавіях* буйны гандл.-рамесны пункт правінцыі Далмацыя і яе адм. цэнтр. З 4 ст. н.э. рэзідэнцыя епіскапа. Разбурана аварамі і славянамі ў 6—7 ст. Захаваліся ўмацаванні з шматвугольнымі вежамі, рэшткі форума, амфітэатра 2 ст. н.э., храма 1 ст., тэрмаў і віл з мазаікамі, базілік 4—5 ст., ант. і раннехрысц. некропаляў, епіскапскага палаца, шматлікія творы ант. скульптуры (статуі, саркафагі з рэльефнымі выявамі), помнікі эпіграфікі і інш.

САЛО́НГА (Salonga), нацыянальны парк у Конга (Дэмакр. Рэспубліка Конга), у даліне р. Салонга (бас. р. Рукі, левы прыток р. Конга). Засн. ў 1970. Пл. 3,6 млн. га. Ландшафты з экватарыяльных забалочаных, прырэчных і сухіх лясоў, участкі злакавай расліннасці. У фауне мартышкі, слон (у т.л. карлікавая форма), карлікавыя буйвал (аноа) і шымпанзэ (банабо), антылопы, кракадзілы, вадаплаўныя птушкі.

САЛО́НЕЦ, возера ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ушача, за 11 км на ПнЗ ад г.п. Ушачы. Пл. 0,73 км^2, даўж. 1,2 км, найб. шыр. 800 м, найб. глыб. 5,9 м, даўж. берагавой лініі 4,4 км. Пл. вадазбору 18,5 км^2. Катлавіна падпруднага тыпу. Схілы выш. 5—7 м, на ПдУ і Пд 1,5—4 м, разараныя, на Пн і У параслі лесам. Пойма на Пн і ПнЗ шыр. да 200 м, забалочаная, укрыта хмызняком. Берагі нізкія, тарфяністыя, на ПдУ пясчаныя, у залівах сплавінныя. 4 залівы. Востраў пл. 0,5 га. Дно карытападобнае, да глыб. 1,7 м пясчанае, да 2,5 м укрыта апясчаным ілам, глыбей сапрапелістае. Прыбярэжная ч. возера зарастае. Упадае ручай з воз. Расна, сцёк у р. Ушача.

САЛО́НІКІ, Саланікі, Фесалонікі (Thessalonikē), горад на Пн Грэцыі, на беразе зал. Тэрмаікос Эгейскага м. Каля 1 млн. ж. з прыгарадамі (2000). Марскі порт (выкарыстоўваецца часткова Македоніяй, Югаславіяй, Балгарыяй), вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Другі, пасля Афін, эканам. цэнтр краіны. Прам-сць: нафтаперапр. і нафтахім., металаапр., маш.-буд., у т.л. суднабудаванне і суднарамонт; тэкст., харчасмакавая, у т.л. тытунёвая; гарбарна-абутковая, цэлюлозна-папяровая. Ун-т. Археал. музей. Турызм. Штогадовыя міжнар. кірмашы.

Засн. ў 315 да н.э. царом Македоніі Касандрам. У старажытнасці і сярэднія вякі наз. Фесалонікі. З 148 да н.э. пад уладай рымлян, з канца 4 ст. н.э. — адм. ц. прэфектуры Ілірык. У 5—6 ст. на С. нападалі *готы*, у 6—7 ст. — славяне. У візант. эпоху С. — другі па значэнні горад пасля *Канстанцінопаля*. З пач. 9 ст. цэнтр фемы Фесалонікі. З С. паходзілі слав. асветнікі *Кірыла і Мяфодзій*. У 904 горад разрабаваны арабамі, у 1185 — *нарманамі*. З 1204 С. — сталіца лац. Фесалонікскай дзяржавы (з 1209 каралеўства). У 1224 стаў цэнтрам Фесалонікскай імперыі. З 1246 у складзе Нікейскай, у 1261 — Візант. імперый. У 1342—49 у горадзе дзейнічала камуна *зілотаў*. У 1387 захоплены туркамі, з 1403 зноў у Візант. імперыі. З 1430 у складзе Асманскай імперыі. З 1907 цэнтр руху *младатуркаў*. Пасля *Балканскіх войнаў 1912—13* адышлі да Грэцыі. У 1-ю сусв. вайну база войск Антанты, якія ўтварылі каля горада Салонікскі фронт 1915—18. У 2-ю сусв. вайну акупіраваны герм. войскамі (1941—44). Вызвалены грэч. Народна-вызв. арміяй.

Салонікі. Царква Апосталаў. 1312—15.

Захаваліся рэшткі асобных пабудоў рым. часу, у т.л. арка Галерыя (303 н.э.), руіны палаца. Помнікі сярэдневяковага дойлідства: крэпасць і замак, рэшткі візант. гар. сцен, шматлікія візант. цэрквы, у т.л. св. Георгія (перабудавана ў канцы 4 ст. са стараж.-рым. пабудовы; ратонда, мазаікі канца 4 ст.; цяпер музей раннехрысц. мастацтва), св. Дзімітрыя (перабудавана ў 11 ст., адноўлена ў 1917, мазаікі 5 і 7 ст., фрэскі 10 — пач. 14 ст.), св. Сафіі (пачата ў 5—6 ст., 717—741, мазаікі 9

Руіны базілікі ў **Салоне**.

Салонікі. Царква святога Дзімітрыя.

ст., фрэскі 11 ст.), Маці Божай (1028, фрэскі 14 ст., пры турках перабудавана ў мячэць), Апосталаў (1312—15, фрэскі і мазаікі 14 ст.) і інш. З 20 манастыроў С. захаваўся адзін — Мані Влатадон з царквой 14 ст. У часы тур. панавання выраслі партовая ч. горада і жылыя кварталы са шчыльнай «усходняй» планіроўкай вуліц. З 1920-х г. праводзіцца рэканструкцыя, узведзены новыя сучасныя дамы, комплекс кірмашу (1950-я г.) і ун-та (1960-я г., арх. К. Карандынас і інш.). Дахрысц. і візант. помнікі С. уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны.*

Я.Ф.Шунейка (архітэктура).

САЛО́НІКІ, Саланік, вёска ў Полацкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 6 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Полацк, 106 км ад Віцебска. 784 ж., 297 двароў (2001). Дом культуры, б-ка, медпункт, аддз. сувязі.

САЛО́НІКСКІЯ АПЕРА́ЦЫІ 1915—1918, наступальныя дзеянні войск *Антанты* (у т.л. 2 рас. брыгады) на Балк. п-аве (каля г. Салонікі, Грэцыя) у 1-ю сусв. вайну. Салонікскі фронт пачаў стварацца ў кастр.— ліст. 1915 пасля высадкі англа-франц. экспедыцыйнага корпуса ў мэтах дапамогі Сербіі стрымаць наступленне аўстра-герм.-балг. войск. У студз. 1916 сюды перакінуты англа-франц., потым італьян. і сербскія войскі і 2 рас. брыгады з Францыі. У выніку створана т.зв. Усх. армія (у 1918 да 29 дывізій). Пасля ўступлення ў вайну Румыніі (жн. 1916) саюзнікі ў вер.— ліст. занялі раён Манасціра. 15.9.1918 войскі Антанты (да іх далучыліся грэч. войскі) пачалі наступленне ўздоўж далiны р. Вардар на Скопле і нанеслі паражэнне балг.-герм. войскам. 29.9.1918 Балгарыя капітулявала, а 11-я герм. армія здалася ў палон.

САЛО́ННАЕ МАСТА́ЦТВА, салонна-акадэмічнае мастацтва, кансерватыўны кірунак у маст. культуры 19 — пач. 20 ст. Зародзілася ў Францыі (дасягнула росквіту ў 1850—70-я г.), пазней пашырылася ў інш. краінах. Назву атрымала з-за яго падтрымкі з боку журы парыжскіх маст. *салонаў*. Агульныя прыкметы С.м.: эклектызм творчага метаду, які грунтаваўся пераважна на нормах акадэмізму 19 ст. і позняга (акад.) класіцызму, адначасова выкарыстоўваючы павярхоўна ўспрынятыя метады і прыёмы рамантызму, пазней — рэалізму і натуралізму; знешняя эфектная прыгажосць кампазіцыі і адназначнасць зместу пры развітой сюжэтнасці; прамалінейнасць трактоўкі значных тэм; фармальная завершанасць, рамесна-тэхн. віртуознасць фактуры, якая імітуе маст. майстэрства; патэтыка, экзальтацыя і ідэалізацыя вобразаў; зарыентаванасць на маст. кан'юнктуру і густ масавага гледача. У С.м. пераважалі міфалагічны і алегарычны (пераважна як падстава для адлюстравання аголенай натуры), быт. (прымітыўна-анекдатычны), гіст. (найчасцей у духу псеўдагіст. касцюмнай меладрамы) жанры, партрэт (ідэалізаваны). Агрэсіўнае непрыняцце ўсяго наватарскага ў мастацтве, імкненне навязаць сваё разуменне «добрага густу», камерцыялізацыя маст. творчасці выклікалі і адваротную рэакцыю ў буйных мастакоў 2-й пал. 19 ст. і іх. супрацьпастаўленне сваёй творчасці С.м. («Маніфест рэалізму» Г.Курбэ ў Францыі, заснаванне Т-ва перасоўных маст. выставак у Расіі і інш.). У 20 — пач. 21 ст. тэрмін «С.м.» ўжываецца таксама як агульнае вызначэнне знешняй прыгажосці і банальнасці, беззмястоўнасці твораў выяўл. мастацтва, спекулятыўнай імітацыі маст. каштоўнасцей.

САЛО́ХА, адзін з найбагацейшых скіфскіх курганоў (т.зв. царскіх) 4 ст. да н.э. за 12 км на ПдУ ад с. Вял. Знаменка Васільеўскага р-на Запарожскай вобл. Украіны. Даследаваны ў 1912—13 М.І.Весялоўскім. Пад насыпам выш. 18 м выяўлены 2 «царскія» пахаванні. Цэнтр. разрабавана ў старажытнасці, бакавое — цэлае. У бакавым разам з царом пахаваны яго слугі — віначэрп і збраяносец.

Залаты грэбень з кургана **Салоха**. 4 ст. да н.э.

Знойдзены наборы зброі, бронзавая булава — знак улады, залатая грыўня, бранзалеты, шматлікія бляшкі ад адзення ці полага, сярэбраныя пасудзіны і інш. Асаблівую маст. каштоўнасць маюць залаты грэбень з фігуркамі скіфаў, якія змагаюцца, і сярэбраны абклад гарыта з выявай пешых і конных воінаў. На З ад царскай грабніцы выяўлена яма з 5 шкілетамі коней, на якіх захаваліся рэшткі аброцей з бронзавымі бляхамі, побач — пахаванне конюха.

Літ.: Сокровища скифских курганов в собрании Государственного Эрмитажа. Прага; Л., 1966.

САЛО́ХІНА Ада Іванаўна (н. 21.2.1943, в. Крым Шкотаўскага р-на Прыморскага краю, Расія), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1971). Аўтар габеленаў: «Асенні матыў» (1973), «Песня планет», «Азёрны край» (абодва 1974), «Белая русь» (з А.Юзеевай, 1975), «Палескі край» (1976), «Абуджэнне» (1978), «Лясная фантазія» (1980), «Яблынька» (1982), «Ізяслаўль» (1983), «Зямля цвіце» (1985), «Раніца туманная» (1989), «Ноч на Івана Купалу» (1992), «Нясвіжскі парк» (1999), «Белыя дзверы» (1996), «Асенні нацюрморт» (2000). Творы вызначаюцца дэкаратыўнасцю, выразнасцю каларыту, ураўнаважанасцю кампазіцыі.

САЛПАЎСЕ́ЛЬКЯ (Salpausselkä), узвышша на Пд і ПдУ Фінляндыі. 3 паралельныя канцавыя грады выш. да 247 м цягнуцца на 550 км уздоўж паўн. узбярэжжаў Фінскага зал. і Ладажскага воз. Адлегласць паміж градамі 30—50 км. Узгоркава-марэнны рэльеф. Складзены з пясчанікаў, галечнікаў, марэннага матэрыялу. Хвойныя і мяшаныя лясы. Некат. рэкі (Іматра і інш.) утвараюць парогі і вадаспады.

САЛТА́ВА-МАЯ́ЦКАЯ КУЛЬТУ́РА, археалагічная культура паўкачавых народаў, што жылі ў 8—9 ст. у бас. р. Дон і Прыазоўі. Назва ад Салтаўскага могільніка каля с. Верхняе Салтава (Харкаўская вобл., Украіна) і Маяцкага гарадзішча каля ўпадзення р. Ціхая Сасна ў р. Дон (Варонежская вобл., Расія). Вядома больш за 200 помнікаў культуры: рэшткі качэўяў, пасёлкаў, замкаў, гарадоў (Саркел, Таматарха, *Фанагорыя*), могільнікаў. Мае 2 варыянты: лесастэпавы — аланскі (гл. *Аланы*) і стэпавы — балгарскі (гл. *Балгарыя Волжска-Камская*). Для 1-га характэрны земляробчыя тыпы паселішчаў і катакомбавы абрад пахавання; для 2-га — качэўі і ямныя пахаванні.

САЛТА́НАЎ Уладзімір Усеваладавіч (н. 15.2.1936, г. Орша Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне фізіялогіі. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1996), д-р біял. н. (1977), праф. (1990). Скончыў Бел. ін-т

А.**Салохіна**. Асенні нацюрморт. 2000.

фіз. культуры (1959). З 1965 у Ін-це фізіялогіі Нац. АН Беларусі (з 1978 заг. лабараторыі, нам. дырэктара). Навук. працы па аналізе функцыян. арганізацыі аферэнтных сістэм унутр. органаў, механізмаў віцэра-вісцэральных рэфлекторных рэакцый, механізмаў самарэгуляцыі вегетатыўных функцый. Вывучыў функцыян. ўласцівасці адчувальных валокнаў органаў брушной і тазавай поласці, паказаў наяўнасць уласных вегетатыўных аферэнтных нейронаў перыферычнага паходжання.

Тв.: Электрофизиологический анализ висцеральных афферентных систем. Мн., 1973 (разам з І.А.Булыгіным); Механизмы саморегуляции вегетативных функций. Мн., 1989; Механизмы саморегуляции вегетативных функций в норме и патологии. Мн., 1994.



Аўтар А.М. Лукашэвіч

САЛТА́НАЎКА, вёска ў Дашкаўскім с/с Магілёўскага р-на. На р. Салтан. За 12 км на Пд ад Магілёва, 4 км ад чыг. ст. Чарназёмаўка. 424 ж., 134 дамы (2002). Пач. школа, дзіцячы сад, клуб, магазін. Помнік рус. воінам. *Салтанаўская мемарыяльная капліца.* Помнікі археалогіі — стаянкі каменнага веку.

У вайну 1812 каля С. 22—23 ліп. адбылася бітва паміж 7-м пях. корпусам ген. М.М.*Раеўскага* (17 тыс. чал.) і франц. войскамі маршала Л.*Даву* (22 тыс. чал.). 20 ліп. корпус Даву захапіў Магілёў і заняў пазіцыі каля С. 2-я Зах. рус. армія ген. П.І.*Багаціёна* адыходзіла з Бабруйска на Магілёў, каб злучыцца з 1-й Зах. рус. арміяй ген. М.Б.*Барклая дэ Толі* (знаходзілася ў раёне Віцебска). Атрымаўшы загад Багаціёна вызваліць Магілёў, корпус Раеўскага 23 ліп. атакаваў французаў пад С. Калі высветлілася, што прарыў праз Магілёў немагчымы, Багаціён з арміяй пад прыкрыццём корпуса Раеўскага адышоў да Новага Быхава і пераправіўся цераз Дняпро. 24 ліп. пакінуў свае пазіцыі каля в. Дашкаўка і Раеўскі. Бітва каля С. дазволіла 2-й Зах. арміі адарвацца ад праціўніка, пераправіцца цераз Дняпро і злучыцца з 1-й Зах. арміяй каля Смаленска. Страты рускіх склалі 2548 чал. забітымі, параненымі і прапаўшымі без вестак, французаў — паводле розных падлікаў ад 3 да 5 тыс. чал.

САЛТА́НАЎСКАЯ МЕМАРЫЯ́ЛЬНАЯ КАПЛІ́ЦА, помнік архітэктуры неакласіцызму ў в. Салтанаўка Магілёўскага р-на. Пабудавана ў 1912 (арх. К.Міхайлаў, скульпт. П.Яцына) з нагоды 100-годдзя перамогі тут рас. войск у вайне 1812. Цаглянае квадратнае ў плане збудаванне мае цэнтрычную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю, завершаную высокім шатром. Нізкі цокаль выступае за плоскасць сцен. Пластыку фасадаў узбагачаюць паўкалоны тасканскага ордэра, антаблементы з трохвугольнымі франтонамі. Вузкія крыжападобныя аконныя праёмы размешчаны ў паўцыркульных нішах. Іл. гл. да арт. *Неакласіцызм.*

А.А.Міцянін.

САЛТАНО́ВА, вёска ў Дземяхоўскім с/с Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл., каля р. Ведрыч. Цэнтр саўгаса. За 15 км на З ад г. Рэчыца, 65 км ад Гомеля, 3 км ад чыг. ст. Дземяхі. 970 ж., 398 двароў (2001). Камбінат харч. прадуктаў «Палессе». Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

САЛТАНО́ЎСКІ ДРАЦЯ́НА-ЦВІКО́ВЫ ЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1872—1917 у в. Салтанова (цяпер у Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл.). Меў паравы рухавік. У 1913 працавала 75 чал. У 1-ю сусв. вайну вырабляў цвікі, калючы дрот, скобы.

САЛТУ́К Алег Уладзіміравіч (н. 25.8.1946, в. Рыжэнькі Шумілінскага р-на Віцебскай вобл.), бел. паэт. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1967). Настаўнічаў, працаваў ва ўшацкай раённай газеце. З 1999 у газ. «Віцебскі рабочы». У 1980—99 сакратар Віцебскага абл. аддзялення Саюза бел. пісьменнікаў. Друкуецца з 1964. Асн. тэмы твораў — мінулае і сучаснае роднай зямлі і народа, яго гераічная памяць, даследаванне нашага складанага і супярэчлівага часу. Вершы С. вылучаюцца пафасам неспакою, любові да свайго краю; цэнтральны вобраз у іх — зямля-карміцелька (зб-кі «Пачатак дня», 1974; «Працяг», 1977; «Святло зямлі», 1982; «На далонях жыцця», 1988; «Трывога лёсу», 1996). Літ. прэмія імя У.Караткевіча 2000.

Тв.: Святло зямлі. Мн., 1992. *І.У.Саламевіч.*

САЛТЫКО́Ў-ШЧАДРЫ́Н Міхаіл Яўграфавіч (сапр. Салтыкоў; літ. псеўд. Н.Шчадрын; 27.1.1826, с. Спас-Вугал Калязінскага р-на Цвярской вобл., Расія — 10.5.1889), рускі пісьменнік, крытык, публіцыст дэмакр. кірунку. Скончыў Царскасельскі ліцэй (1844). Служыў чыноўнікам у Пецярбургу. Светапогляд С.-Ш. складваўся пад уплывам В.Бялінскага, М.Гогаля, А.Герцэна, ідэй петрашэўцаў і франц.

М.Я.Салтыкоў-Шчадрын.

утапічнага сацыялізму. Друкаваўся з 1841 (вершы). Першыя аповесці «Супярэчнасці» (1847) і «Заблытаная справа» (1848) сталі прычынай высылкі аўтара ў Вятку (1848—55), дзе С.-Ш. служыў чыноўнікам губернскага праўлення. Пасля вяртання ў Пецярбург служыў у Мін-ве ўнутр. спраў (1856—58), віцэ-губернатарам у Разані, пазней у Цверы (1858—62), з 1864 — у сістэме Мін-ва фінансаў у Пензе, Туле, Разані. У 1868 выйшаў у адстаўку. У 1863—65 супрацоўнік час. «Современник», з вер. 1868 член рэдакцыі і актыўны супрацоўнік, з 1877 адказны рэдактар час. «Отечественные записки» да забароны гэтага выдання ў 1884. У цыкле сатыр. нарысаў і апавяданняў «Губернскія нарысы» (1856—57), «Нявінныя апавяданні» (1857—63), «Пампадуры і пампадуршы» (1863—74), «Гісторыя аднаго горада» (1869—70), «Паны ташкентцы» (1869—72), «Дзённік правінцыяла ў Пецярбургу» (1872), «Добранамераныя прамовы» (1872—76), «За мяжой» (1880—81), раманы «Паны Галаўлёвы» (1875—80) і інш. паказаў крызіс прыгоннага ладу, дасціпна крытыкаваў бюракратыю, прыстасавальніцтва, маральную дэградацыю дваранства, рэакц. сутнасць і амаралізм прускага мілітарызму і паказной парламенцкай дэмакратыі. Сатырычны талент С.-Ш. ярка выявіўся ў апошніх творах: «Казкі» (1882—86, асобнае выданне 1884 нелегальна пад назвай «Казкі для дзяцей немалога ўзросту», легальна выд. 1887; частка казак апубл. пасмяротна), «Дробязі жыцця» (1886—89), «Пашахонская даўніна»

(1887—89), дзе пісьменнік выкарыстаў прыёмы памфлета і гратэска, убачыў сваю эпоху ў кантрастных і трагічных тонах. Аўтар камедый «Смерць Пазухіна» (1857, забаронена; паст. 1893), «Цені» (1862—65, не завершана; паст. 1914), публіцыстычнага цыкла «Наша грамадскае жыццё» (1864), літ.-крытычных артыкулаў.

Творчасць С.-Ш. паўплывала на станаўленне камічнага жанру ў бел. л-ры, творчасць В.Дуніна-Марцінкевіча, Ядвігіна Ш., К.Крапівы, развіццё публіцыстыкі, драматургіі, тэатр. мастацтва. У бел. крытыцы і літ.-знаўстве яго спадчына разглядалася як важнае звяно сацыяльна ангажыраванай маст. культуры ў кірунку крытычнага рэалізму. Газ. «Минский листок» убачыла ў ім выдатнага мысліцеля і асветніка. Супрацоўнік газ. «Голос провинции» М.Караліцкі адзначаў актуальнасць выкрывальніцкай творчасці С.-Ш. для сучаснасці. Газ. «Гомельская мысль» у артыкулах «З мінулага», «М.Я.Салтыкоў-Шчадрын», «М.Я.Салтыкоў-Шчадрын. Да 25-годдзя з дня смерці» паведаміла новыя факты з жыцця пісьменніка, адзначыла ўплыў Бялінскага, Дабралюбава і Някрасава на станаўленне яго светапогляду. Да традыцый С.-Ш. часта звяртаўся бел. сав. крытыка 1930-х г. як аргумента пры абгрунтаванні рэаліст. метаду. Бел. друк у 1930-я г. адзначыў 50-годдзе з дня смерці С.-Ш. ў арт. «Вялікі сатырык» М.Дабрыніна і інш. публікацыях. Апублікаваны бібліягр. даведнік «М.Я.Салтыкоў-Шчадрын» (1939). У 1950—70-я г. бел. літ.-знаўцы Дз.Палітыка, І.Ішчанка, Н.Сніцарава даследавалі важныя аспекты літ., сац.-філасофскай і журналісцкай спадчыны С.-Ш. У дарэв. час мясцовыя і прыезджыя тэатр. трупы паказвалі п'есы С.-Ш. ў Мінску, Гродне, Віцебску, Магілёве, Гомелі і інш. У Брэсце ў 1883 паказана інсцэніроўка «Паны Галаўлёвы». На бел. мову яго творы перакладалі К.Чорны («Казка аб заўзятым начальніку...», 1936), У.Ляўданскі (кн. «Выбраныя апавяданні», 1948), Я.Шарахоўскі («Казкі», 1953), В.Вітка («Паны Галаўлёвы», 1956), Х.Жычка (казка «Кісель», 1976) і інш.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—20. М., 1965—77.

Літ.: Салтыков-Щедрин в воспоминаниях современников. Т. 1—2. М., 1975; Политыко Д.А. Великий русский писатель-сатирик М.Е.Салтыков-Щедрин. Мн., 1955; Ищенко И.Т. Пародии Салтыкова-Щедрина. Мн., 1973; Бушмин А.С. Художественный мир Салтыкова-Щедрина: Избр. тр. Л., 1987; Николаев Д.П. Смех Щедрина: Очерки сатир. поэтики. М., 1988; Ауэр А.П., Борисов Ю.Н. Поэтика символических и музыкальных образов М.Е.Салтыкова-Щедрина. Саратов, 1988; Салтыков-Щедрин и русская литература. Л., 1991; М.Е.Салтыков-Щедрин: пробл. мировоззрения, творчества, языка. Тверь, 1991; Герасимович М.М. Уроки М.Е.Салтыкова-Щедрина. Мн., 1993.

У.М.Конан.

САЛУ́ІН, Салуэн (тыбецкае Наг-Чу, кіт. Нуцзян), рака ў Кітаі і М'янме, часткова — мяжа паміж М'янмай і Тайландам. Даўж. каля 3200 км, пл. басейна каля 325 тыс. км². Пачынаецца з ледавікоў хр. Тангла на У Тыбецкага нагор'я. Цячэ па Юньнаньскім і Шанскім нагор'ях у глыбокіх (да 3 тыс. м) цяснінах, утварае парогі і вадаспады, у ніжнім цячэнні — па раўніне. Упадае 2 рукавамі ў Андаманскае м. Рэжым мусонны з летнімі паводкамі (пад'ём узроўню ў цяснінах на 15 м і больш). Сярэдні расход вады каля 6700 м³/с. Сплаўная, суднаходная ў ніжнім цячэнні на 120 км. У вусці — марскі порт Малам'яйн.

САЛЫ́НСКІ Афанасій Дзмітрыевіч (9.9.1920, г. Смаленск, Расія — 22.8.1993), рускі драматург. Скончыў Вышэйшыя літ. курсы пры Літ. ін-це імя М.Горкага ў Маскве (1956). Выступаў як журналіст з 1939. У 1972—82 і з 1987 гал. рэдактар час. «Театр». Першая п'еса — «Дарога першых» (паст. 1949; перапрацаваная рэдакцыя «Браты», паст. 1951). Маральна-этычныя канфлікты сучаснасці ў п'есах «Небяспечны спадарожнік» (паст. 1952), «Забыты сябар» (1955), «Марыя» (1969), «Летнія прагулкі» (1973) і інш. Драмы «Барабаншчыца» (паст. 1958), «Каменьчыкі на далоні» (1965) пра Вял. Айч. вайну. Драма «Погалас» (1980; Дзярж. прэмія СССР 1984) пра перыяд нэпа. Аўтар камедый «Хлусня для вузкага кола» (1963), «Пераход на летні час» (1983), зб. артыкулаў «Пра жыццё, драматургію, тэатр» (1982), сцэнарыяў фільмаў і інш. У Дзярж. рус. т-ры Беларусі пастаўлены п'есы С. «Барабаншчыца» (1959), «Марыя» (1970).

Тв.: Избранное. Т. 1—2. М., 1988; Драмы и комедии. М., 1977.

Літ.: Фельдман Я. Драматургия Афанасия Салынского. М., 1976.

САЛЬВАДО́Р (Salvador), Рэспубліка Эль-Сальвадор (República de El Salvador), дзяржава ў Цэнтр. Амерыцы. Мяжуе на З з Гватэмалай, на Пн і У з Гандурасам; на Пд абмываецца Ціхім ак. Пл. 21,04 тыс. км². Нас. 6,3 млн. чал. (2000). Дзярж. мова — іспанская. Сталіца — г. *Сан-Сальвадор*. Краіна падзяляецца на 14 дэпартаментаў. Нац. свята — Дзень незалежнасці (15 вер.).

Дзяржаўны лад. С. — унітарная рэспубліка, дзейнічае канстытуцыя 1983 (з папраўкамі 1991). Кіраўнік дзяржавы і ўрада — прэзідэнт, які выбіраецца на 5 гадоў. Вышэйшы заканад. орган — аднапалатная Заканадаўчая асамблея; 84 яе дэпутаты выбіраюцца на 3 гады па сістэме прапарцыянальнага прадстаўніцтва.

Прырода. Цэнтр. ч. краіны займае вулканічнае нагор'е з выш. 600—700 м, абмежаванае на Пн і Пд вулканічнымі хрыбтамі. На паўд. хрыбце дзейныя вулканы (Санта-Ана, 2381 м, найб. актыўны Ісалька, 1885 м). На Пн тэктанічная ўпадзіна, дзе цячэ р. Лемпа. На ўзбярэжжы раўніна шыр. да 30 км. Частыя землетрасенні. У недрах С. ёсць золата, серабро, цынк, медзь, сера, нафта. Клімат трапічнага пояса пасатны. На нагор'і т-ры ад 22 (снеж.) да 25 °С (крас.). Ападкаў на нагор'і 1500—2500 мм, ва ўпадзіне Лемпы 600—700 мм за год. Вылучаюцца 2 сезоны — сухі (ліст.—крас.) і дажджлівы (май—кастр). Шмат кароткіх горных рэк і вулканічных азёр. Пераважае культ. раслінасць. Лясы і лясістая мясцовасць займаюць 5% тэр., у гарах месцамі хваёвыя лясы, у далінах — трапічная раслінасць, участкі саваннаў, другасныя хмызнякі. Жывёльны свет: малпы, ацэлот, апосум, браняносец, шмат птушак, змей, насякомых. Нац. паркі: Монтэ-Крыста, Эль-Імпасібле; рэзерват Эль-Хакаталь.

Насельніцтва. Каля 92% складаюць сальвадорцы, народ, які ўтварыўся ад змяшання іспанцаў з мясц. індзейскім насельніцтвам. Каля 5% складае індзейскі народ піпіль. Жывуць таксама гандурасцы, гватэмальцы, мексіканцы, амерыканцы ЗША, кітайцы і інш. 86% вернікаў — католікі, астатнія пераважна пратэстанты. Сярэднегадавы прырост насельніцтва 1,02% (2000). Сярэдняя шчыльн. 300 чал. на 1 км². 75% насельніцтва пражывае на нагор'і, дзе шчыльн. дасягае 500 чал. на 1 км². У гарадах 46% насельніцтва. Найб. Сан-Сальвадор — 1408 тыс. ж. з прыгарадамі

Герб і сцяг **Сальвадора**.

(2000). Буйныя гарады (тыс. ж., 1993): Санта-Ана — 208,3, Сан-Мігель — 161,2, Сакатэкалука — 81. У сельскай гаспадарцы занята 33% працаздольнага насельніцтва, у прам-сці — 14%, у абслуговых галінах — 53%. Значная эміграцыя ў суседнія краіны і ЗША.

Гісторыя. Да 7 ст. н.э. С. насялялі плямёны індзейцаў *майя*. Потым тут пасяліліся блізкія да ацтэкаў плямёны піпіляў, якія называлі краіну і свой гал. горад Кускатлан. У 1524—47 гэта тэр. заваявана іспанцамі на чале з П.дэ Альварада, якія далі ёй назву С. У калан. перыяд С. быў часткай генерал-капітанства Гватэмала. У 1811—14 тут адбылося некалькі антыкалан. паўстанняў. 15.9.1821 абвешчана незалежнасць С. У 1822—23 С. у складзе Мексіканскай імперыі, у 1823—39 — Злучаных правінцый Цэнтр. Амерыкі. З 1841 С. — незалежная рэспубліка. Доўгі час улада ў краіне па чарзе належала то партыі кансерватараў, якая адлюстроўвала інтарэсы латыфундыстаў, то партыі лібералаў, якая абараняла інтарэсы гандлёвай буржуазіі. Барацьба паміж імі суправаджалася шматлікімі ваен. пераваротамі. На першых свабодных выбарах у сак. 1931 перамог А.Араўха, які прапанаваў праграму шырокіх сац. пераўтварэнняў. У снеж. 1931 ён скінуты ген. М.Эрнандэсам Марцінесам, які ўсталяваў сваю дыктатуру (1931—44). У студз. 1932 ён люта задушыў сял. паўстанне на чале з А.Фарабунда Марці (забіта больш за 10 тыс. чал.). Да 1979 С. кіравалі ваен. рэжымы, якія адлюстроўвалі пераважна інтарэсы алігархаў, што дамінавалі ў эканам. і паліт. жыцці краіны. Па іх ініцыятыве створаны ваенізаваныя атрады для запалохвання апазіцыі. У ліп. 1969 С. вёў вайну з Гандурасам, што абвастрыла сац. супярэчнасці. З канца 1970-х г. пачаліся масавыя выступленні супраць рэжыму, партыз. дзейнасць актывізаваў падпольны Фронт нац. вызвалення імя Фарабунда Марці (ФНВФМ) — шырокі саюз левых арг-цый. У гэтых абставінах, пры дапамозе ЗША, у кастр. 1979 адбыўся ваен. пераварот, які прывёў да ўлады ваен.-цывільную хунту. Новы рэжым абяцаў ажыццяўленне рэформ, але ў краіне працягвала панаваць ранейшая алігархія, лютаваў тэрор правых «эскадронаў смерці», якія забівалі незадаволеных рэжымам і сялян, што адважваліся ўзяць зямлю пасля абвешчанай аграрнай рэформы. Правы тэрор прывёў у пач. 1981 да масавага паўстання на чале з ФНВФМ. Пры дапамозе ЗША рэжым цывільнага прэзідэнта Х.Н.Дуартэ (1980—90) здолеў утрымаць уладу, але ён не кантраляваў ні сельскія раёны, дзе панаваў ФНВФМ, ні ўрадавую армію. У выніку грамадз. вайны да 1990 загінула больш за 70 тыс. чал.

Пры пасрэдніцтве ААН 1.2.1992 заключана мірнае пагадненне паміж урадам С. і ФНВФМ, які стаў паліт. партыяй. У 1994 пад наглядам ААН адбыліся выбары, на якіх перамагла правая партыя Нацыяналіст. рэспубліканскі саюз. Яе прадстаўнікі А.Кальдэрон і Ф.Флорэс выбіраліся прэзідэнтамі С. ў 1994 і 1999. ФНВФМ стаў другой па значэнні паліт. партыяй С., дамогся поспеху на парламецкіх выбарах 2000. С. — чл. ААН (з 1945), Арг-цыі амер. дзяржаў (з 1947). Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены ў кастр. 1999. Дзейнічаюць паліт. партыі: Нацыяналіст. рэсп. саюз (АРЕНА), Фронт нац. вызвалення імя Фарабунда Марці, Хрысц.-дэмакр. партыя.

Гаспадарка. С. — аграрная краіна. Аснова эканомікі — вытв-сць і перапрацоўка с.-г. прадукцыі. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) на душу насельніцтва каля 3000 дол. ЗША. Доля ў ВУП сельскай гаспадаркі 12%, прам-сці 22%, абслуговых галін 76%. Эканоміка моцна залежыць ад замежнага, пераважна амер. капіталу. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 1,3 млн. га зямлі — больш за 60% тэр. краіны. Пад ворывам і шматгадовымі насаджэннямі 690 тыс. га, у т.л. 120 тыс. га арашаецца; пад лугамі і пашай каля 610 тыс. га. Традыцыйна развіта латыфундысцкая гаспадарка. Значная частка сялян беззямельная: на долю 90% сельскага насельніцтва прыпадае толькі 4% апрацаваных зямель. Пашыраны розныя формы арэнды і паўфеад. формы эксплуатацыі. Гал. раён земляробства — вулканічнае нагор'е. У 1998 сабрана (тыс. т): кавы (гал. экспартная культура, дае каля $^2/_3$ кошту прадукцыі земляробства, вырошчваецца ў зах. і цэнтр. частках нагор'я) 251,2, цукр. трыснягу 590, кукурузы 1215,2, бабовых (пераважна фасоля) 99,1, рысу 106,2, сорга 366,6. Вырошчваюць таксама бавоўну, тытунь, какаву, індыга, хенекен, проса, кунжут, ямс і маніёк, алейныя культуры, агародніну. Трапічнае і субтрапічнае садоўніцтва. Жывёлагадоўля найб. развіта па Пн краіны. У 1997 было 1,14 млн. галоў буйн. раг. жывёлы, 335,1 тыс. свіней. Птушкагадоўля (у 1997 — 8 млн. курэй). Прам-сць прадстаўлена ў асн. харч., лёгкай, нафтахім., фармацэўтычнай, буд., металургічнай і металаапрацоўчай галінамі. У 1999 атрымана 4,1 млрд. кВт·гадз электраэнергіі, у т.л. 49,3% на цеплавых электрастанцыях, 36,5% на ГЭС, 14,2% на гідратэрмальных электрастанцыях. Харч. прадукты і напіткі складаюць (1998) 36% кошту прамысл. прадукцыі; тэкстыль, адзенне, абутак, скураныя вырабы і мэбля — 13,9%; нафтапрадукты, хімікаты і вырабы з каўчуку — 15,3%; металург. і маш.-буд. галіна — 13,4%, паліграф. і цэлюлозна-папяровыя вырабы — 7,5% і інш. Асн. цэнтры харч. і тэкст. прам-сці — гарады Сан-Сальвадор і Санта-Ана, нафтаперапрацоўка і цэм. з-ды ў г. Акахутла. Гарнарудная прам-сць прадстаўлена невял. здабычай золата, серабра, буд. матэрыялаў, каменнай солі. Развіта сматужная вытв-сць ганчарных вырабаў, адзення, абутку, капелюшоў. Замежны турызм у 2000 прынёс даход 211 млн. долараў. Транспарт чыг., аўтамаб., марскі. У 1997 было 602 км чыгункі, 10 тыс. км аўтадарог, у т.л. 1986 км з цвёрдым пакрыццём (327 км аўтастрады — Панамерыканскай шашы). У С. 35,3 тыс. легкавых аўтамабіляў, 44,8 тыс. грузавых і аўтобусаў (2000). Гал. парты Ла-Уньён, Акахутла і Ла-Лібертад. У краіне 85 аэрапортаў, у т.л. 4 з цвёрдым пакрыццём узлётнай паласы (у т.л. міжнар. аэрапорт каля г. Сан-Сальвадор). У 1999 экспарт склаў 2,5 млрд. долараў, імпарт— 4,15 млрд. долараў. У экспарце пераважаюць кава, цукар, тэкстыль, хімікаты, у імпарце — харч., спажывецкія і прамысл. тавары, нафта і нафтапрадукты. Асн. гандл. партнёры: ЗША (59% экспарту, 51% імпарту), Гватэмала (12 і 9%), Мексіка, Гандурас, Японія. С. атрымлівае эканам. дапамогу ад ЗША і міжнар. арг-цый. Грашовая адзінка — калон.

М.Б.Жукава (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *Н.Р.Кошалева* (гісторыя).

Сальвадор. Адзін з вулканаў у цэнтральнай частцы краіны.

Сальвадор. Сушка зярнят кавы.

САЛЬВАТА́ЦЫЯ (ад лац. solvere растварацъ), узаемадзеянне часціц (малекул, іх асацыятаў, іонаў) растворанага рэчыва з малекуламі растваральніку. Уплывае на ўсе фіз. і фіз.-хім. працэсы, што адбываюцца ў растворах. Абумоўлена электрастатычнымі і ван-дэр-ваальсавымі сіламі ўзаемадзеяння (неспецыфічная С.), а таксама каардынацыйнымі сувязямі і вадародная сувяззю (спецыфічная С.). У выніку С. ўтвараюцца сальваты — малекулярныя ўтварэнні пастаяннага ці пераменнага саставу, у якіх малекула (іон) растворанага рэчыва абкружана сальватнай абалонкай з малекул растваральніку. Асобны выпадак С. — *гідратацыя*.

Літ.: Бургер К. Сольватация, ионные реакции и комплексообразование в неводных средах: Пер. с англ. М., 1984.

САЛЬВІ́НІ (Salvini) Тамаза (1.1.1829, г. Мілан, Італія — 31.12.1915), італьянскі акцёр. З акцёрскай сям'і. У 1842 дэбютаваў на прафес. сцэне. З 1843 у трупе пад кіраўніцтвам Г.*Модэны*, які паўплываў на яго творчасць. З 1860-х г. узначальваў свае трупы. Творчасці ўласцівы рамант. ўзнёсласць, гераічны пафас у спалучэнні з глыбокім пранікненнем у псіхалогію вобраза. Сусв. славу яму прынеслі выкананне гал. роляў шэкспіраўскай драматургіі: Атэла, Гамлет, Макбет, Кароль Лір у аднайм. п'есах. Сярод інш. лепшых роляў: Карада («Грамадзянская смерць» П.Джакамеці), Арасман («Заіра» Вальтэра). Аўтар мемуараў і тэарэт. артыкулаў.

САЛЬВІ́НІЯ (Salvinia), род папарацей сям. сальвініевых. 10 відаў. Пашыраны пераважна ў тропіках Паўд. Афрыкі і Амерыкі, часткова — ва ўмераных абласцях. На Беларусі 1 від — С. плывучая, або вадзяная папараць (S.natans), занесеная ў Чырв. кнігу. Трапляецца на Палессі ў стаячых (поймавыя азёры, старыцы) і з павольнай плынню водах, утварае зараснікі.

Адна- ці шматгадовыя дробныя водныя разнаспоравыя папараці. Сапраўдныя карані адсутнічаюць. Сцёблы галінастыя, ніткападобныя, апушаныя, даўж. да 10 см. Лісце па 3 у кальчаках, 2 з іх зялёныя, суцэльныя, плаваюць на паверхні, 3-і — спараносны — апушчаны ў ваду, буры, рассечаны на ніткападобныя долі і нагадвае карані. Дэкар. (акварыумныя) расліны, выкарыстоўваюцца як прыродныя фільтры, у рыбаводстве.

А.М.Скуратовіч.

Сальвінія плывучая.

СА́ЛЬВІЯ, род кветкавых раслін, тое, што *шалфей*.

САЛЬВО́ЛІЗ (ад лац. solvo растваряю + грэч. lysis растварэнне, распад), абменная рэакцыя паміж растворанымі рэчывам і растваральнікам. Суправаджаецца раскладаннем малекул растваральніку і растворанага рэчыва. У адрозненне ад *сальватацыі* прыводзіць да ўтварэння новых хім. злучэнняў пэўнага саставу. С. у водных растворах наз. *гідролізам*.

СА́ЛЬДА (ад італьян. saldo разлік, рэшткі), рознасць паміж грашовымі паступленнямі і расходамі за пэўны перыяд. У *бухгалтарскім уліку* С. — рознасць паміж сумамі па *дэбету* і *крэдыту* рахункаў. Дэбетовае С. (дэбет большы за крэдыт) паказвае велічыню рэшткаў гасп. сродкаў, крэдытавае (крэдыт большы за дэбет) — стан крыніц гасп. сродкаў. У бухгалтарскім балансе рахункі з дэбетовым С. складаюць актыў, з крэдытавым — пасіў. У міжнар. гандлі С. — рознасць паміж сумай *экспарту* і *імпарту* або сумай патрабаванняў і абавязацельстваў. У гандл. балансе станоўчае С. — перавышэнне экспарту над імпартам, адмоўнае — перавышэнне імпарту. У плацежным балансе станоўчае С. — перавышэнне агульнай сумы паступленняў краіны над яе плацяжамі інш. краінам, адмоўнае — перавышэнне плацяжоў краіны над яе паступленнямі з інш. краін.

САЛЬЕ́РЫ (Salieri) Антоніо (18.8.1750, г. Леньяга, Італія — 7.5.1825), італьянскі кампазітар, дырыжор, педагог. З 1766 у Вене, прыдворны клавесініст, кампазітар, дырыжор; з 1778 кіраўнік опернага т-ра і прыдворнай капэлы. З 1817 дырэктар заснаванай у Вене кансерваторыі. Стварыў больш за 40 опер, у т.л. опер-буфа «Венецыянскі кірмаш» (паст. 1772), «Школа раўнівых» (паст. 1778), міфалагічных, гераіка-трагічных, у т.л. «Данаіды» (паст. 1784); зрабіў значны ўклад у развіццё ням. *зінгшпіля* («Камінар», паст. 1781). Сярод твораў 4 араторыі, кантаты, 5 мес, рэквіем, творы для арк. і інш. Сярод вучняў Л.Бетховен, Ф.Ліст, Ф.Шуберт і інш.

СА́ЛЬЗЫ, тое, што *грязевыя вулканы*.

САЛЬМАНЕЛЁЗЫ, вострыя інфекцыйныя захворванні чалавека і жывёл, якія выклікаюць *сальманелы*; пераважна пашкоджваецца страўнікава-кішэчны тракт. Вядома больш за 2 тыс. сератыпаў узбуджальніка С. Для чалавека крыніца заражэння — свойскія жывёлы і птушкі, таксама людзі-носьбіты сальманел. Інфекцыя заносіцца праз прадукты харчавання, кантактна-бытавым шляхам. Вылучаюць лакалізаваныя формы С., генералізаваныя і бактэрыяносьбіцтва. Пры лакалізаваных цячэнне хваробы вострае, з высокай т-рай цела, болямі ў вобласці жывата, ірвотай, вадзяністым стулам са сліззю, абязводжваннем арганізма. Пры генералізаваных С. узбуджальнік цыркулюе ў крыві; назіраецца працяглая ліхаманка з сімптомамі інтаксікацыі. Бактэрыяносьбіцтва выяўляецца пры бактэрыял. абследаванні. Лячэнне тэрапеўтычнае. Жывёлы і птушкі заражаюцца праз кармы, глебу, ваду, пры кантакце з хворымі, праз прадметы догляду.

А.А.Астапаў.

САЛЬМАНЕ́ЛЫ (Salmonella), род *энтэрабактэрый*. Адносяцца пераважна да патагенных відаў (узбуджальнікі тыфапаратыфозных захворванняў і харч. таксікаінфекцый, гл. *Сальманелёзы*), маюць у сабе эндатаксін. Знаходзяцца ў кішачным тракце чалавека і пазваночных жывёл. Доўга захоўваюцца ў вонкавым асяроддзі і харч. прадуктах.

Прамыя палачкі з закругленымі канцамі. Рухомыя. Грамадмоўныя. Факультатыўныя анаэробы, *гетэратрофы*. Сералагічна разнастайныя (больш за 2 тыс. сератыпаў), класіфікуюцца па антыгенных уласцівасцях.

САЛЬМІЗА́ЦЫЯ (італьян. solmisazione ад назвы муз. гукаў соль і мі), сальфеджыо, сальфеджыраванне, спевы мелодый з вымаўленнем назваў гукаў, адзін з прыёмаў муз. навучання. Існуюць 2 роды С. — адносная і абсалютная. Пры адноснай С. за кожнай ступенню гукарада замацоўваецца пэўная назва незалежна ад абсалютнай вышыні. Самыя стараж. сістэмы С.: кітайская (5-ступеневая), індыйская (7-ступеневая), грэчаская (4-ступеневая), сярэдневяковая зах.-еўрап. (уведзена Гвіда д'Арэца, 6-ступеневая са складовымі назвамі ut, re, mi, fa, sol, la). Усе яны былі адносныя. У сістэме гексахордаў для С. мелодый з вял. дыяпазонам ужывалася *мутацыя*: пры гэтым гукі атрымлівалі назвы адносна новага вышыннага стану (увесь гукарад «надбудоўваўся» пры перамяшчэнні гексахорда на кварту ці квінту ўверх ці ўніз, адсюль паняцце адноснай С.). Італьян. тэарэтык Дж.Доні для зручнасці спеваў замяніў склад ut складам do (каля 1540). Увядзенне склада si пры дабаўленні да гукарада 7-й ступені (Х.Вальрант, каля 1547) зрабіла залішняй мутацыю ў межах адной танальнасці. У 16—19 ст. ў Германіі і Францыі існавалі адносныя сістэмы С. з назвамі лічбаў. На Беларусі выкарыстоўваецца адносная С. са складовымі назвамі ё, лэ, ві, на, зо, ра, ці. Абсалютная С. — спевы мелодыі з назвай абсалютнай вышыні гукаў. У Францыі ў пач. 18 ст. выкарыстоўвалі склады ut, re, mi, fa, sol, la, si для абазначэння гукаў c, d, e, f, g, a, h. Гэты спосаб наз. натуральным сальфеджыраваннем, бо ў ім не браліся пад увагу знакі *альтэрацыі*. Абсалютная С. пашырылася пасля выдання «Сальфеджый для навучання ў кансерваторыі музыкі ў Парыжы», складзеныя Л.Керубіні, Ф.Гасекам, Э.Мегюлем і інш. (1802). У 19—20 ст. распрацоўвалася мноства сістэм С. Пад С. часам разумеюць рытмізаванае чытанне нот без інтанавання, у адрозненне ад тэрміна «сальфеджыо» («Курс сальфеджый» К.Альбрэхта, 1880). Такое тлумачэнне не адпавядае сучаснаму міжнар. выкарыстанню тэрміна «С.».

Н.Г.Мазурына.

СА́ЛЬНІКАЎ Уладзімір Аляксандравіч (4.8.1924, г. Гусь-Хрустальны Уладзімірскай вобл., Расія — 22.9.1982), бел. канструктар радыёэлектроннай апаратуры і выліч. тэхнікі. Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т (1952). З 1953 на Віцебскім з-дзе электравымяральных прыбораў, з 1963 дырэктар Брэсцкага электрамех. з-да. Распрацоўваў перыферыйныя прылады для АС ЭВМ, апаратуру для тэлеапрацоўкі даных і вылічальных комплексаў спец. прызначэння. Дзярж. прэмія СССР 1981.

М.П.Савік.

СА́ЛЬНІКАЎ Уладзімір Валяр'янавіч (н. 21.5.1960, С.-Пецярбург), расійскі спартсмен (плаванне). Засл. майстар спорту СССР (1978). Чэмпіён Алімп. гульняў у Маскве (1980) у плаванні вольным стылем на дыстанцыі 400 м, 1500 м і ў эстафеце 4 × 200 м, свету (1978, 1982), Еўропы (1977, 1981, 1983) і СССР (1978—87) на розных дыстанцыях.

САЛЬПУ́ГІ, біхоркі, фалангі (Solifugae), атрад членістаногіх кл. павукападобных. Каля 10 сям., да 30 родаў, каля 800 відаў. Найб. пашыраны ў тропіках і субтропіках (акрамя Аўстраліі і

астравоў Ціхага ак.). Жывуць у норах, пад камянямі. Большасць відаў актыўныя ўначы; вельмі рухавыя.

Даўж. да 7 см. Афарбоўка бура-жоўтая, радзей стракатая або цёмная. На галавагрудзях 2 пары вачэй (бакавыя недаразвітыя). Галавагрудзі расчлянёны на пярэдні аддзел і сегменты 3 задніх пар канечнасцей. Канечнасцей 6 пар, у т.л. буйныя клюшнепадобныя *хеліцэры*. Масіўнае брушка мае 10 сегментаў. Цела і канечнасці густа ўкрыты валаскамі і шчацінкамі. Дыхаюць трахеямі. Драпежнікі. Раздзельнаполыя, адкладваюць яйцы; развіццё без *метамарфозу*.

Сальпы: 1 — звычайная; 2 — рыючая.

САЛЬПЫ (Salpae), клас хордавых жывёл падтыпу абалоннікаў (паводле інш. класіфікацыі — атрад кл. пелагічных абалоннікаў Thaliacea). 2 атр. (падкл.): бачоначнікі (Cyclomyaria) і ўласна С. (Desmomyaria), 25 відаў. Пашыраны ва ўсіх акіянах, акрамя Паўн. Ледавітага. Свабоднаплаваючыя адзіночныя і каланіяльныя жывёлы. Трымаюцца пераважна паблізу паверхні вады. Здольныя да свячэння (за кошт сімбіятычных бактэрый).

Даўж. ад некалькіх міліметраў да 33 см. Цела бочачкападобнае, укрыта празрыстай абалонкай (тунікай). Сэрца на брушным баку, крывяносная сістэма незамкнёная. Нерв. сістэма прадстаўлена надглотачным нерв. вузлом, над якім размешчана святлоадчувальнае вочка. Дыхаюць жабрамі. Кормяцца фітапланктонам. Гермафрадыты. Жыццёвы цыкл адбываецца з чаргаваннем палавога і бясполага пакаленняў. Бясполыя асобіны (аазоіды) размнажаюцца пачкаваннем. Развіццё без стадыі лічынкі. У дарослых знікае хорда і хвост. Корм для некат. рыб, марскіх чарапах.

А.М.Петрыкаў.

САЛЬТА (ад італьян. salto скачок), у акрабатыцы, гімнастыцы, фігурным катанні на лёдзе — поўны паварот у паветры цераз галаву (уперад ці назад) пры скачку. Напр., двайное С., трайное С. Асобна вылучаецца С.-мартале — смяротны скачок, які выкарыстоўваецца цыркавымі артыстамі-акрабатамі.

САЛЬТА (Salta), горад на Пн Аргенціны. Адм. ц. прав. Сальта. Засн. ў 1582 іспанцамі. Каля 400 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Гандл. цэнтр с.-г. раёна (цукр. трыснёг, тытунь, рыс). Прам-сць: харчасмакавая, гал. чынам цукровая і тытунёвая; лёгкая, нафтаперапрацоўчая. 2 ун-ты. Арх. помнікі 17—18 ст. Паблізу здабыча баратаў.

САЛЬТАНАБА́Д, другая назва *Эрак* у зах. ч. Ірана.

САЛЬТЫ́ЛЬЁ (Saltillo), горад на ПнУ Мексікі. Адм. ц. штата Кааўіла. Засн. ў 1575 іспанцамі. Каля 500 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Цэнтр раёна здабычы волава і серабра. Прам-сць: каляровая металургія, цяжкое і с.-г. машынабудаванне, хім., тэкст., шарсцяная (выраб пледаў-сарапе), харчовая. Злучаны трубаправодамі з раёнамі нафтагазавай прам-сці на ўзбярэжжы Мексіканскага зал. 2 ун-ты, у т.л. Міжамерыканскі. Арх. помнікі 18 ст.

САЛЬФАТА́РЫ (ад італьян. solfatara ад solfo сера), струмені сярністага і серавадароднага газаў (т-ра 100—300 °С) з прымесямі пары вады, вуглякіслага і інш. газаў, якія выдзяляюцца з трэшчын сценак і дна кратэра, на схілах вулканаў. С. называюць таксама вулканы, якія спакойна і доўгі час выдзяляюць такія газы (напр., вулкан Сальфатара каля г. Неапаль). Гл. таксама *Фумаролы*.

САЛЬФЕ́ДЖЫО, сальфеджа (італьян. solfeggio ад назвы муз. гукаў соль і фа), 1) тое, што *сальмізацыя*. 2) Вучэбная дысцыпліна, прызначаная для развіцця муз. слыху і памяці. Уключае сальфеджыраванне (адна- ці шматгалосыя спевы з вымаўленнем назваў гукаў), муз. дыктант, аналіз на слых; існуюць абсалютная (фіксаваная да), рэлятыўная і лічбавая сістэмы С. 3) Зборнікі практыкаванняў для адна- ці шматгалосага сальфеджыравання ці аналізу на слых. 4) Спец. вак. практыкаванні для развіцця голасу (гл. *Вакаліз*).

Н.Г.Мазурына.

САЛЬЦІСО́Н, у беларусаў традыц. мясны выраб. Адвараныя, дробна парэзаныя, пасоленыя свіныя вантробы (лёгкія, печань, сэрца, ныркі), а таксама галавізна, прыпраўленыя часнаком, перцам і інш. спецыямі, перамешваюць, кладуць у тоўстыя свіныя кішкі ці страўнік і зноў вараць ці падпякаюць у печы. Потым на 1—1,5 сут прыціскаюць гнётам. Ядуць халодным.

САЛЮБІЛІЗА́ЦЫЯ (ад позналац. solubilis растваральны), калоіднае растварэнне, пранікненне малекул нізкамалекулярных рэчываў, нерастваральных у дадзенай вадкасці, унутр *міцэл* ці глобул *макрамалекул*, што знаходзяцца ў ёй. Напр., непалярныя малекулы вуглевадародаў і тлушчаў салюбілізуюцца воднымі растворамі мылаў (гл. *Мыйнае дзеянне*). Адыгрывае важную ролю ў шэрагу тэхнал. працэсаў (эмульсійнай палімерызацыі, міцэлярным каталізе, пры атрыманні змазачна-ахаладжальных вадкасцей і інш.), а таксама ў біял. сістэмах (напр., пры страваванні тлушчы салюбілізуюцца жоўцю).

САЛЮ́СТЫЙ Гай Крысп (Gaius Sallustius Crispus; 86 — 35 да н.э.), старажытнарымскі гісторык і дзярж. дзеяч. Удзельнічаў у грамадз. войнах 49—45 да н.э. на баку Ю.*Цэзара*. З 46 да н.э. праконсул рым. правінцыі Новая Афрыка. Пасля смерці Цэзара (44 да н.э.) займаўся літ. дзейнасцю. Захаваліся інвек-

Сальпы: 1 — талія (калонія); 2 — вялікая; 3 — даліёлум; 4 — цыкласальпа (калонія).

тыва (выступленне) С. супраць Цыцэрона (54 да н.э.), лісты да Цэзара (каля 50—46 да н.э.) з прапановамі рэфармавання дзярж. ладу, 2 кнігі «Пра змову Катыліны» і «Югурцінская вайна», адметныя глыбокім псіхал. аналізам, дакладнасцю ацэнак падзей, напружанай дынамікай апавядання, невял. фрагменты твора «Гісторыя» (36—35 да н.э.).

Тв.: Рус. пер. — Соч. М., 1981.

САЛЮ́Т [франц. salut ад лац. salus (salutis) віншаванне, прывітанне], 1) урачыстая форма прывітання або аддачы пашаны артыл. і ружэйнымі залпамі, а ў ВМФ (ВМС) таксама флагамі, феерверкам і інш. прыёмамі. Праводзіцца ў азнаменаванне ўрачыстых дат, дзярж. (нац.) свят і інш. (урачысты С.), у час афіц. цырымоній сустрэч кіраўнікоў замежных дзяржаў і ўрадаў (С. нацыі — 21 артыл. выстрал або залп), у гонар дзярж. і ваен. дзеячаў (асабісты С.), пры пахаванні дзярж. дзеячаў, ваеннаслужачых і асоб, якія маюць пэўныя заслугі (жалобны С.). Аддаюцца таксама С. ваен. караблям (злучэнням караблёў) пры іх прыбыцці ў замежны порт або ваен.-марскую базу з афіц. візітам і інш. Прымяненне, парадак правядзення і сродкі С. прадугледжаны спец. палажэннямі, статутамі, міжнар. канвенцыямі і інш. 2) Прывітанне падняццем рукі ў некат. грамадскіх і паліт. арг-цыях (напр., піянерскі С.).



Арбітальная станцыя «Салют»: 1 — панэлі сонечных батарэй; 2 — шматзанальны фотаапарат; 3 — спальнае месца; 4 — антэны тэлеметрычных сістэм; 5 — адсек навуковай апаратуры; 6 — цэнтральны пост; 7 — сістэма газавага забеспячэння.

«САЛЮ́Т», серыя сав. *арбітальных станцый* для палётаў па каляземнай арбіце; праграма іх распрацоўкі, запускаў і эксплуатацыі. Прызначаліся для правядзення медыка-біял., астрафіз., навукова-тэхн., тэхнал. даследаванняў і эксперыментаў, назіранняў і даследаванняў Зямлі, яе атмасферы і каляземнай касм. прасторы. Макс. маса 18,9 т, маса навук. апаратуры да 2,5 т, аб'ём жылых адсекаў каля 100 м^3. Палёты здзяйсняліся з касманаўтамі на борце і ў аўтам. рэжыме. У 1971—83 запушчаны 7 «С.» (на арбіту выводзіліся ракетай-носьбітам *«Пратон»* з касмадрома *Байканур*).

«С.» складаліся з пераходнага, рабочага, агрэгатнага (з рухальнай установкай) адсекаў і прамежкавай камеры («С.-6» і «С.-7» мелі дадатковы стыковачны агрэгат). У склад «С.» ўваходзілі сістэмы жыццезабеспячэння, электрасілкавання (сонечныя батарэі), сувязі, арыентацыі і кіравання, стыкоўкі з касм. караблямі, навук. абсталяванне і інш. «С.» не прызначаліся для вяртання на Зямлю; дастаўка і змена экіпажа праводзіліся пры дапамозе касм. караблёў *«Саюз»*, паліва, абсталявання і інш. — трансп. караблямі *«Прагрэс»*. «С.-1» (запуск 19.4.1971) — першая ў свеце пілатуемая арбітальная станцыя (экіпаж Г.Ц.*Дабравольскі*, У.М.*Волкаў*, В.І.*Пацаеў*). Да «С.» здзейснілі палёты 50 касм. апаратаў. На борце «С.» працавалі 17 асн. экспедыцый (14—237 сут) і 15 экспедыцый наведвання (3—13 сут). У складзе міжнар. экіпажаў па праграме *«Інтэркосмас»* на «С.-6» і «С.-7» працавалі касманаўты 10 краін свету. Камандзірамі экспедыцый былі і ўраджэнцы Беларусі П.І.*Клімук* («С.-4», «С.-6» — міжнар.) і У.В.*Кавалёнак* («С.-6» — двойчы). *У.С.Ларыёнаў.*

САЛЮТА́ЦЫ (Salutati) Калуча (16.2.1331, Стыньяна, каля г. Пістоя, Італія — 4.5.1406), італьянскі дзярж. дзеяч, гуманіст. Паводле адукацыі натарыус. Вучань і паслядоўнік Ф.*Петраркі*. У 1375—1406 канцлер Фларэнцыйскай рэспублікі, дзе ўзвёў *гуманізм* у ранг афіц. дзярж. ідэалогіі. Адыграў вял. ролю ў арганізацыі гуманіст. гурткоў, збіранні і вывучэнні ант. рукапісаў. У шматлікіх трактатах абараняў свабоду волі чалавека, выступаў супраць саслоўных прывілеяў, адмаўляў правы рым. пап на свецкую ўладу, крытыкаваў заганы духавенства, адстойваў рэсп. свабоды, абгрунтоўваў права падданых забіць тырана, але апраўдваў сац. няроўнасць.

САЛЮТРЭ́ (франц. Solutré), салютрэйская культура, археал. культура верхняга палеаліту (19—15 тыс. г. да н.э.), якая змяніла арыньякскую (гл. *Арыньяк*) і перыгорскую культуры і папярэднічала *мадлену*. Пашырана на тэр. Францыі і Іспаніі. Выяўлена франц. археолагам Г. дэ Мартылье ў 1860-я г. Назва ад стаянкі Салютрэ (дэпартамент Сона і Луара, Францыя). Насельніцтва культуры С. карысталася крамянёвымі наканечнікамі лаўра- ці вербападобнай формы, выкананымі ў тэхніцы адціскальнай рэтушы. Частка іх выкарыстоўвалася ў якасці наканечнікаў коп'яў і дроцікаў, частка — як нажы і кінжалы. Знойдзены крамянёвыя скрабкі, разцы, праколкі, вастрыі, касцяныя наканечнікі, іголкі з вушкамі і інш.

САЛЯ́НАЯ КІСЛАТА́, хлорыставодародная кіслата, раствор *хлорыстага вадароду* ў вадзе; моцная аднаасноўная неарганічная к-та, HCl. Ёсць у *страўнікавым соку* жывёл і чалавека.

Бясколерная празрыстая вадкасць (тэхн. С.к. жоўта-зялёнага колеру з-за прымесей жалеза, хлору і інш.). Канцэнтраваная С.к. (макс. канцэнтрацыя пры 20 °С 40% HCl па масе, шчыльн. 1198 кг/м^3) дыміць у паветры. С.к. ўзаемадзейнічае з вылучэннем вадароду з металамі, якія маюць адмоўныя нармальныя патэнцыялы, з аксідамі і гідраксідамі металаў (утварае *хларыды*). У прам-сці атрымліваюць адыябатычнай ці ізатэрмічнай *абсорбцыяй* хлорыстага вадароду вадой. Выкарыстоўваюць у гідраметалургіі, для ачысткі паверхні металаў пры пайцы і луджэнні, для атрымання хларыдаў металаў (цынку, марганцу, жалеза і інш.), пры вытв-сці каўчукоў, соды, хлору і інш.

САЛЯНА́Я ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна *харчовай прамысловасці*, якая займаецца здабычай і апрацоўкай кухоннай (каменнай) солі. Здабыча марской і азёрнай солі пачалася развівацца задоўга да н.э. ў Стараж. Егіпце, Грэцыі, Рыме. У Расіі солеварэнне вядома з пач. 12 ст. Найб. развіта ў ЗША, Кітаі, Германіі, Расіі, Польшчы, Украіне і інш. На Беларусі С.п. пачала развівацца ў 2-й пал. 20 ст. з распрацовак адкладаў *Старобінскага радовішча калійных і каменнай солей* (дзейнічае вытв. аб'яднанне *«Беларускалій»*) і *Мазырскага радовішча каменнай солі* (працуе *Мазырскі солевыварны камбінат*). Асн. прадукцыя: кухонная соль «Палессе» і інш. з дабаўкамі ёду і фтору, соль прафілакт. з дабаўкамі мікраэлементаў, соль без дабавак. Гадавая здабыча солі (тыс. т) — 192,7 (1985), 356 (1990), 343,2 (1999).

САЛЯНА́Я ТЭКТО́НІКА, галакінез, працэсы і структуры, звязаныя з перамяшчэннем саляных мас у зямной кары. Развіваецца пры наяўнасці саляносных фармацый з магутнымі пластамі каменнай і калійных солей, нераўнамерным ціску вышэйляжачай тоўшчы і дыферэнцыраваным перамяшчэнні падсалявога ложа і фундамента ў выніку тэктанічных працэсаў. З прычыны пластычнасці і адносна нізкай удзельнай вагі саляныя масы перамяшчаюцца на ўчастках з меншым ціскам. Узнікаюць саляныя масівы, якія прыўздымаюць, выгінаюць (нярэдка прарываюць) верхнія пласты і ўтвараюць саляныя структуры (купалы, антыкліналі, геміантыкліналі, штокі і інш.). Над участкамі, з якіх адцякае соль, надсалявыя пласты прагінаюцца, утвараюцца кампенсацыйныя мульды. У краявых і міжгорных прагінах складкавых абласцей, дзе С.т. развіваецца ва ўмовах бакавога ціску, саляносныя ўтварэнні праяўляюцца ў ядрах лінейных складак, нярэдка ўздоўж ліній тэктанічных разрываў. У скляпеннях і крылах саляных купалаў і антыкліналей часта знаходзяцца пакла-

ды нафты і газу, а саляныя ядры распрацоўваюцца для атрымання каменнай і калійных солей. Класічныя вобласці С.т. — Прыкаспійская ўпадзіна, упадзіна Мексіканскага зал. і яго ўзбярэжжа і інш. На Беларусі С.т. пашырана ў *Прыпяцкім прагіне*. Найб. актыўна праявілася ў верхнефаменскай галітавай субфармацыі (памеры падняццяў 10—30 км^2) і ў меншай ступені ў верхняфранскай саляноснай фармацыі (70—100 км^2). Большасць з падняццяў прыразломныя, надразломныя, нярэдка групуюцца ў саляныя валы (напр., Рэчыцкі вал). Некат. ядры або скляпенныя і прыскляпенныя ч. саляных купалаў і антыкліналей маюць нафтавыя паклады. Гл. таксама *Прыпяцкі саляносны басейн*. *Д.М.Ярошына.*

САЛЯ́НІКАЎ Анатоль Данілавіч (н. 19.7.1919, в. Чурылава Аршанскага р-на Віцебскай вобл.), Герой Сав. Саюза

А.Д.**Салянікаў**.

(1944). Скончыў Энгельскую ваен. авіяшколу пілотаў (1941). У Чырв. Арміі з 1941. У Вял. Айч. вайну з 1942 на Бранскім, 2-м Прыбалт. франтах. Камандзір эскадрыллі штурмавікоў маёр С. зрабіў 115 баявых вылетаў, знішчыў 12 самалётаў, 10 танкаў, 120 аўтамашын, 6 мінамётаў, 18 гармат, 44 павозкі з грузам, шмат жывой сілы ворага. Да 1947 у Сав. Арміі, да 1981 на адм.-гасп. рабоце.

САЛЯ́НКА (Salsola), род кветкавых раслін сям. лебядовых. Больш за 200 відаў. Пашыраны ў пустынях і паўпустынях Еўразіі, Афрыкі, заносныя ў Амерыцы і Аўстраліі. На Беларусі 3 віды С.: пантыйская (S.pontica), руская, або курай, паташнік, ці попельнік (S.ruthenica), і ўзгоркавая (S.collina). Трапляюцца ўздоўж дарог, чыгунак, на пустках, каля жылля.

Аднагадовыя травы, невял. дрэвы, кусты ці паўкусты. Сцёблы прамастойныя або ўзыходныя, растапырана-галінастыя, цвёрдаапушаныя. Лісце невял., вузкае, мясістае, суцэльнае, чаргаванае, на верхавінцы звычайна шыпаватае. Кветкі малапрыкметныя, адзіночныя ў пазухах лісця або ў коласападобных ці мяцёлчатых суквецціях, двухполыя. Плод — сухі арэшак. Корм для вярблюдаў, авечак, коз; некат. віды выкарыстоўваюцца для замацавання пяскоў. Дэкар. расліны.

А.М.Скуратовіч.

САЛЯ́РНЫ КЛІ́МАТ (ад лац. solaris сонечны), 1) радыяцыйны клімат, умоўны клімат, які разлічваецца тэарэтычна па размеркаванні сонечнай радыяцыі на зямной паверхні ў залежнасці толькі ад шыраты мясцовасці і пары года (без уліку кліматаўтваральных фактараў і працэсаў, што адбываюцца ў атмасферы, асаблівасцей подсцільнай паверхні і інш.). Адхіленне т-ры паветра і інш. характарыстык С.к. ад рэальных адлюстроўвае ролю мясц. геагр. фактараў і асаблівасцей цыркуляцыі атмасферы ў фарміраванні клімату пэўнага рэгіёна. 2) Рэжым сонечнай радыяцыі і эфектыўнага выпрамянення ў дадзеным месцы.

САЛЯРЦІ́НСКІ Іван Іванавіч (3.12.1902, г. Віцебск — 11.2.1944), расійскі гісторык музыкі, тэатра, літаратуры. Скончыў Ленінградскі ун-т (1924). З 1929 працаваў у Ленінградскай філармоніі (з 1940 маст. кіраўнік), з 1936 адначасова ў Ленінградскай кансерваторыі (з 1939 праф.). Абуджэннем цікавасці да муз. мастацтва, веданнем сімф. рэпертуару ў многім абавязаны М.*Малько*. Выступаў як лектар і крытык-публіцыст па пытаннях мастацтва, эстэтыкі, псіхалогіі. Зрабіў значны ўклад у распрацоўку праблем класічнай муз. спадчыны, сімфанізму, опернай і балетнай драматургіі, паўплываў на творчасць Дз. Шастаковіча. Аўтар артыкулаў па зах.-еўрап. муз. класіцы, харэаграфіі, тэатр. мастацтве, л-ры, а таксама па тагачаснай замежнай і сав. музыцы.

Тв.: Исторические этюды. Критические статьи. Т. 1—2. 2 изд. Л., 1963; Статьи о балете. Л., 1973.

Літ.: Шостакович Д. И.И. Соллертинский // Сов. музыка. 1946. № 2—3; Памяти И.И. Соллертинского: Воспоминания, материалы, исслед. 2 изд. Л., 1978. *Б.С.Смольскі.*

САЛЯ́РЫЙ (лац. solarium ад sol Сонца), 1) у старажытных рымлян — тэраса, плоскі дах на паўд. баку дома. 2) Другая назва *сонечнага гадзінніка*. 3) Спец. абсталяваная адкрытая пляцоўка для прыняцця сонечных ваннаў (гл. *Сонцялячэнне*). 4) У птушкагадоўлі — абгароджаная пляцоўка з цвёрдым пакрыццём падлогі для выгулу птушак.

Салянка звычайная.

САМА́ (?—658), славянскі князь [623—658], заснавальнік першага гіст. вядомага паліт. аб'яднання зах. і ч. паўд. славян, т.зв. дзяржавы С. (тэр. сучасных Чэхіі, Маравіі, землі лужыцкіх сербаў, ч. зямель славенцаў і харватаў) з цэнтрам, верагодна, у Маравіі. Паводле франкскай хронікі Фрэдэгара (7 ст.), С. быў франкскім купцом, што аспрэчваецца многімі гісторыкамі, якія лічаць яго славянінам. Князем стаў у 623, калі ўзначаліў паўстанне славян супраць улады *авараў*. Пазней паспяхова ваяваў з аварамі і *франкамі*. Пасля смерці С. яго дзяржава распалася.

САМААБАРО́НА ЛІТВЫ́ І БЕЛАРУ́СІ (Samoobrona, Samoobrona Litwy і Białorusi), польскія вайсковыя фарміраванні на тэр. Літвы і Беларусі, акупіраванай у 1-ю сусв. вайну герм. войскамі. Стваралася з мэтай абароны інтарэсаў мясц. польскага насельніцтва, а таксама як авангард польскай арміі. Іх органы пачалі стварацца з 1918 афіцэрамі б. 1-га польскага корпуса ген. Ю.Р.Доўбар-Мусніцкага пры падтрымцы мясц. польскіх паліт. колаў. Гал. цэнтрамі самаабароны сталі Мінск, Вільня, Ліда, Гродна; яе часці дзейнічалі ў Шчучыне, Свіры, Вілейцы, Ашмянах, Радуні, Эйшышках. У выніку супрацьдзеяння герм. боку і наступлення Чырв. Арміі 29.12.1918 С.Л. і Б. ліквідавана, а яе часці фармальна ўвайшлі ў склад польскай арміі. Замест самаабароны, як органа кіраўніцтва польскімі вайсковымі фарміраваннямі на акупіраванай немцамі тэрыторыі, створана Ген. акруга Літвы і Беларусі. Жорсткае задушэнне рэв. руху, яўр. пагромы, абарона інтарэсаў польскіх землеўласнікаў, рэквізіцыі і інш. выклікалі негатыўныя адносіны да самаабароны з боку мясц. няпольскага насельніцтва. *А.М.Чарнякевіч.*

САМААБСЛУГО́ЎВАННЕ, форма продажу тавараў, пры якой пакупнік самастойна робіць іх агляд, адбор, дастаўку да разлікова-касавага вузла. Забяспечвае найлепшыя ўмовы для адбору і набыцця тавараў, павялічвае прапускную здольнасць магазінаў, дазваляе больш эфектыўна выкарыстоўваць гандл. абсталяванне, плошчы і г.д.

САМААДНАЎЛЕ́ННЕ, працэс аднаўлення цэлага з разрозненых частак або надбудовы недастаючых яго элементаў пасля разбурэння цэлага ці страты ч. яго элементаў. У прыродных сістэмах — працэс бесперапыннага аднаўлення або ўзнаўлення структуры, уласцівасцей, колькаснага і якаснага складу прыродных сістэм, які адбываецца без удзелу чалавека; самастойнае вяртанне прыродных сістэм да стану дынамічнай раўнавагі, з якога яны былі выведзены ўздзеяннем прыродных ці антрапагенных фактараў. Напр., скла-

данне занава гідры з фрагментаў яе цела, рэгенерацыя хваста ў яшчаркі, *сукцэсія*, якая вядзе да С. заканамернага шэрагу экасістэм і завяршаецца *клімаксам* як апошнім звяном паслядоўных змен *біягеацэнозаў* або фарміраваннем вузлавых *згуртаванняў*.

САМААДУКА́ЦЫЯ, мэтанакіраваная пазнавальная дзейнасць, якая кіруецца самой асобай; набыццё сістэм. ведаў у якой-н. галіне навукі, тэхнікі, культуры, паліт. жыцці і інш. самаст. работай па-за навуч. ўстановамі; адзін са сродкаў *самавыхавання*. Мэта С. — атрыманне кваліфікацыі або павышэнне адукац. ўзроўню. Асн. віды С. — агульная і спецыяльная. Асн. форма — вывучэнне навук., навукова-папулярнай, вучэбнай, маст. і інш. л-ры. Крыніцамі С. служаць таксама праслухоўванне лекцый, дакладаў, фоназапісаў, кансультацыі спецыялістаў, прагляд кінафільмаў, наведванне музеяў, выставак; розныя віды практычнай дзейнасці — *эксперыменты, доследы* і інш. С. — абавязковы кампанент сучаснага навучання. Яна можа развівацца адначасова з вучобай у навуч. установе (пашыраць, дапаўняць, паглыбляць вучэбны матэрыял), а можа быць і самаст. у адносінах да навучання (вывучэнне новых курсаў, якіх няма ў навуч. установе).

САМААКУ́ПНАСЦЬ, прынцып гаспадарання, які прадугледжвае поўнае пакрыццё затрат вытв. аб'яднанняў, прадпрыемстваў, арг-цый на выраб і збыт прадукцыі (паслуг) уласнымі *даходамі*, атрыманымі ад рэалізацыі створанай прадукцыі або аказаных паслуг. Пры працягласці або значнасці страт, калі прынятыя меры па забеспячэнні *рэнтабельнасці* не далі станоўчых вынікаў, дзейнасць прадпрыемства спыняецца і яно аб'яўляецца банкрутам (гл. *Банкруцтва*). С. валютная — прынцып гасп.-разліковай знешнеэканам. дзейнасці прадпрыемства, які ва ўмовах абмежаванай канверсоўнасці (неканверсоўнасці) нац. валюты прадугледжвае кампенсаванне валютных расходаў валютнымі даходамі. *У.Р.Залатагораў.*

САМААПЛАДНЕ́ННЕ, зліццё мужчынскай і жаночай палавых клетак, якія ўтвараюцца ў адной асобіны. Адбываецца звычайна пры немагчымасці *перакрыжаванага апылення* і апладнення (неспрыяльныя ўмовы, адсутнасць палавога партнёра). Сярод жывёл трапляецца ў гідраў, некат. кольчатых чарвей, малюскаў, рыб (гл. *Гермафрадытызм*); сярод раслін — у шэрагу водарасцей, грыбоў, кветкавых раслін (гл. *Самаапыленне*). У працэсе эвалюцыі ў арганізмаў з'явіліся прыстасаванні, якія прадухіляюць С. і забяспечваюць перакрыжаванае апладненне, у выніку чаго павялічваецца генет. разнастайнасць патомства і жыццяздольнасць асобін віду. *Р.Г.Заяц.*

САМААПЫЛЕ́ННЕ, працэс пераносу пылку з пыльнікаў кветкі на рыльца песціка той самай кветкі або інш. кветкі адной расліны. У адных раслін С. — аблігатны (асноўны) спосаб *апылення* (авёс, пшаніца, некат. крыжакветныя), у другіх — факультатыўны (рэзервовы), выкліканы неспрыяльнымі ўмовамі. Звычайна адбываецца пад канец цвіцення, рэдка да яго пачатку. Пастаяннае С. бывае часцей у аднагадовых раслін. Эвалюцыя кветкавых раслін ішла па шляху выпрацоўкі шматлікіх прыстасаванняў, якія перашкаджаюць С. і спрыяюць *перакрыжаванаму апыленню*. Але ў большасці яно спалучаецца з С., таму што генет. С. спрыяе стабілізацыі адзнак віду, а перакрыжаванае — розным камбінацыям і ўзмацненню ўнутрывідавой зменлівасці. Прыватны выпадак С. — *клейстагамія*. *Р.Г.Заяц.*

САМААРГАНІЗАВА́ЛЬНАЯ СІСТЭ́МА, сістэма, у якой працэс прыстасавання (адаптацыі) да непрадбачаных змен уласцівасцей кіравальнага аб'екта і навакольнага асяроддзя адбываецца шляхам аўтам. змены структуры сістэмы і якаснай змены алгарытма яе функцыянавання. Да С.с. могуць падключацца або адключацца ад іх асобныя падсістэмы, зменьвацца сувязі паміж імі ці схемы іх супадпарадкавання і інш. з мэтай аптымізацыі працэсаў кіравання і кампенсацыі знешніх уздзеянняў, захавання работаздольнасці сістэмы.

Акрамя С.с. да самапрыстасавальных (адаптыўных) сістэм у залежнасці ад спосабу адаптацыі адносяцца саманастройвальныя сістэмы (аўтаматычна зменьваюць уласныя характарыстыкі для кампенсацыі ўзбурэнняў, якія дзейнічаюць на сістэму) і саманавучальныя сістэмы (аўтаматычна мяняюць алгарытм свайго функцыянавання па меры назапашвання вопыту кіравання). Выкарыстанне ўсіх тыпаў самапрыстасавальных сістэм, у т.л. і С.с., дазваляе аптымізаваць рэжым функцыянавання кіравальнага аб'екта, спрашчае уніфікацыю сістэм кіравання, скарачае час на выпрабаванне і наладку кіроўных прыстасаванняў і інш. Да адаптыўных сістэм адносяцца *самапрыстасавальныя робаты*. Прынцыпы С.с. выкарыстоўваюцца для аптымізацыі сістэм аўтаматычнага кіравання, пры мадэліраванні біял. працэсаў.

Літ.: Самоорганизующиеся системы: Пер. с англ. М., 1964; Николис Г., Пригожин И. Самоорганизация в неравновесных системах: Пер. с англ. М., 1979; Хакен Г. Информация и самоорганизация: Макроскопич. подход к сложным системам: Пер. с англ. М., 1991; Берже П., Помо И., Видаль К. Порядок в хаосе: Пер. с фр. М., 1991. *М.П.Савік.*

САМААРГАНІЗА́ЦЫЯ, працэс узнікнення, узнаўлення і ўдасканальвання складанай дынамічнай сістэмы. Ажыццяўляецца шляхам перабудовы ранейшых ці стварэння новых сувязей паміж элементамі сістэмы. Уласцівасці С. выяўляюцца ў аб'ектах рознай прыроды (жывая клетка, арганізм, біял. папуляцыя, чалавечы калектыў і інш.). Працэсы С. маюць мэтанакіраваны, але натуральны, спантанны характар; працякаюць ва ўзаемадзеянні з навакольным асяроддзем, але адносна незалежныя ад яго. Адрозніваюць 3 тыпы працэсаў С.: самазараджэнне арганізацыі (узнікненне новай цэласнай сістэмы з шэрагу аўтаномных аб'ектаў); падтрымліванне сістэмы на пэўным узроўні арганізацыі пры змене ўнутр. і знешніх умоў яе функцыянавання; удасканальванне і самаразвіццё сістэм. Праблемы С. даследуюцца ў *кібернетыцы* і *сінергетыцы*. Гл. таксама *Самаарганізавальная сістэма, Самарух, Развіццё*.

САМААХО́ВЫ ЗБРОЯ, зброя, прызначаная для выкарыстання грамадзянамі ў мэтах самааховы; адзін з відаў т.зв. грамадз. зброі (побач са спартыўнай, паляўнічай і халоднай зброяй).

Падзяляецца на: агнястрэльную зброю гладкаствольную (у т.л. з патронамі траўматычнага дзеяння) і бясствольную (з патронамі траўматычнага, газавага і святлогукавога дзеяння), газавую (газавыя пісталеты і рэвальверы, мех. распыляльнікі, аэразольныя і інш. прыстасаванні са слёзатачывымі або раздражняльнымі рэчывамі), электрашокавыя прыстасаванні і іскравыя разраднікі (дазваляюць

Самааховы зброя: 1 — аэразольны ахоўны балон «Чаромха»; 2 — электрашокер «Ласка»; 3 — бясствольны комплекс «Аса»; 4 — газавы (сігнальны) рэвальвер.

уздзейнічаць на нападаючага высокім эл. напружаннем і выклікаюць у яго часовую недзеяздольнасць). Газавыя пісталеты і рэвальверы звычайна падобныя на папулярныя мадэлі баявой зброі. Для самааховы можа выкарыстоўвацца і *паляўнічая зброя*. Класіфікацыя, правілы набыцця і выкарыстання С.з. ўстанаўліваюцца адпаведным заканадаўствам краіны.

Літ.: Щелоков А.А. Оружие самозащиты. М., 1993; Газовые пистолеты и револьверы: Справ. пособие. Мн., 1997. *В.І.Вараб'ёў.*

САМААЧЫШЧЭ́ННЕ НАВАКО́ЛЬНАГА АСЯРО́ДДЗЯ, здольнасць прыродн-

нага асяроддзя раскладаць, уключаць у біятычны кругаварот, засвойваць (асіміляваць) або пераводзіць у індыферэнтны стан забруджвальныя антрапагенныя выкіды, што трапляюць у яго. Уключае працэсы пераносу рэчываў з аднаго асяроддзя ў другое (атм. ападкамі, паветр. плынямі, вадасцёкамі), фільтрацыю вадкіх рэчываў праз глебу і інш. Пры ўключэнні ў біял. кругаварот асн. ролю адыгрываюць сапратрофныя арганізмы (бактэрыі, грыбы, прасцейшыя), шматклетачныя жывёлы-фільтранты; прадуцэнты (зялёныя расліны і хемасінтэзуючыя мікраарганізмы), кансументы (жывёлы). Інтэнсіўнасць С.н.а. залежыць ад буфернай ёмістасці экасістэм, колькасці ультрафіялетавай радыяцыі, сумы актыўных т-р асяроддзя, наяўнасці акісляльнікаў і інш. Буфернасць экасістэм і біясферы ў цэлым значна зменшылася з прычыны вял. намнажэння ў навакольным асяроддзі ксенабіётыкаў (пестыцыдаў, цяжкіх металаў, дэтэргентаў, фенолаў, пластмас і інш.), многія з якіх не ўтылізуюцца натуральным шляхам і негатыўна ўплываюць на арганізмы-дэтаксікатары. *П.І.Лабанок.*

САМАВЫДАВЕ́ЦКІ ДРУК, самвыдат, агульная назва афіцыйна незарэгістраваных непадцэнзурных рукапісных, друк., аўдыёвізуальных і электронных носьбітаў інфармацыі для распаўсюджвання сярод пэўнай аўдыторыі ва ўмовах абмежаванняў свабоды слова. У СССР развіваўся пераважна ў Маскве і Ленінградзе (час. «Хроника текущих событий», «Синтаксис», альманах «Метрополь»), Прыбалт. рэспубліках, на Украіне, быў вядомы таксама ў Венгрыі, Польшчы, Чэхаславакіі і інш. б. сацыялісц. краінах.

Традыцыі бел. С.д. бяруць пачатак з твораў Афанасія Філіповіча і С.Буднага, «Мужыцкай праўды» К.Каліноўскага, нелегальнага час. народнікаў «Гомон». Аднак у сучасным разуменні, як друк, непадкантрольны дзяржаве і альтэрнатыўны афіц. сродкам масавай інфармацыі, склаўся толькі ў Сав. Беларусі. Паводле крыніц інфармацыі падзяляецца на рэтраспектыўны (перавыданні раней надрук. дакументаў) і бягучы (арыгінальныя тэксты). Спосабы яго рэпрадуктавання: машынапіс, машынапіс з ксерапамнажэннем, ратапрынт, прынтэр, фотадрук.

Штуршком да актывізацыі самавыдавецкага руху стаў XX з'езд КПСС. На працягу 1960 — 1-й пал. 1980-х г. вядома аб узнікненні ў БССР шляхам С.д. прыкладна 20 рэтраспектыўных дакументаў і больш за 10 арыгінальных перыяд. і монавыданняў. Найб. адметныя арыгінальныя тэксты гэтага перыяду: час. «Падсьнежнік» (1963—64, аўтар-выдавец М.Ермаловіч), «Блакітны ліхтар» (1971—74, В.Мудроў, А.Рыбікаў, В.Шлыкаў), «Мілавіца» (1974—76, У.Арлоў, Г.Кулажанка, І.Чарняўскі і інш.), «Гутарка» (1975—76, Ермаловіч), «Люстра дзён» (1980, С.Дубавец, В.Вячорка, С.Сокалаў), творы л-ры і гісторыі — «Сказ пра Лысую гару» (1-я пал. 1970-х г., аўтар невядомы), «Па слядах аднаго міфа» Ермаловіча (2-я пал. 1970-х г.) і інш. Вял. ўплыў на развіццё С.д. зрабілі працэсы лібералізацыі грамадства ў 2-й пал. 1980-х г. З 1988 пачалі выдавацца незарэгістраваныя газ. «Кантроль», «Навіны БНФ «Адраджэньне», «Студэнцкая думка». Да канца 1988 на Беларусі налічвалася 7 афіцыйна незарэгістраваных выданняў, у 1989 — 34, у 1990 — 53. Асн. тэмы С.д. — грамадска-паліт. сітуацыя ў БССР і СССР, «белыя плямы» гісторыі, праблемы бел. дзяржаўнасці і мовы, пераадоленне наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, падтрымка прадпрымальніцкай ініцыятывы і інш.

С.д. пайшоў на спад з прыняццем у СССР 1.8:1990 «Закона аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі», які адмяніў папярэднюю цэнзуру. На працягу некалькіх наст. месяцаў частка самавыдавецкіх газет і часопісаў прайшла працэдуру афіц. рэгістрацыі, іншыя спынілі сваё існаванне. Чарговы этап актывізацыі С.д. назіраўся з сярэдзіны 1990-х г., што звязана з адсутнасцю буйнога капіталу на айч. медыя-рынку і абмежаванай колькасцю недзярж. сродкаў масавай інфармацыі, а таксама з пашырэннем кола карыстальнікаў камп'ютэрнай тэхнікай. З 1995 шматлікім грамадскім арг-цыям, клубам па інтарэсах, гурткам, навуч. установам заканадаўствам дазволена выдаваць часопісы, газеты, інфарм. бюлетэні без афіц. рэгістрацыі ў Мін-ве інфармацыі, калі кожны чарговы выпуск не перавышаў 499 экз. (пасля прыняцця змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі» ад 8.1.1998 — 299 экз.). Паралельна ўсё большае распаўсюджванне набываюць электронныя выданні ў глабальнай сетцы Інтэрнет. З 1995 да жн. 2001 вядома аб выхадзе каля 600 друк. і 40 электронных выданняў без уліку рэкламнай прадукцыі і агітацыйнай л-ры ў час кампаній па выбарах прэзідэнта, Вярх. Савета, Палаты прадстаўнікоў Нац. сходу і мясц. органаў улады.

Літ.: Тимофеева Л.Н. Альтернативная печать: ее сущность и значение // Пресса: опыт, пробл. и тенденции. М., 1992; Пазацэнзурны перыядычны друк Беларусі (1971—1990): Каталёг. Мн., 1998. *С.І.Грыб.*

САМАВЫХАВА́ННЕ, свядомая, мэтанакіраваная дзейнасць чалавека на ўдасканальванне сваіх станоўчых якасцей і пераадоленне адмоўных. Элементы С. прысутнічаюць у дзяцей дашкольнага ўзросту. Патрэбнасць у самапазнанні, самааналізе і самаацэнцы пачынае праяўляцца ў падлеткавым узросце. Аднак, не маючы дастатковага сац. вопыту і псіхал. падрыхтоўкі, падлеткі не заўсёды здольныя зразумець матывы ўласных учынкаў і здзейсніць С. без дапамогі дарослых. Таму ім патрэбна тактоўнае пед. кіраўніцтва. У юнацкім узросце, калі асобныя якасці чалавека ў значнай ступені сфарміраваліся, С. становіцца больш мэтанакіраваным і ўсвядомленым. У працэсе выпрацоўкі светапогляду, прафес. самавызначэння больш яскрава выяўляецца і патрэба ў С. інтэлектуальных, маральных і фіз. якасцей асобы ў адпаведнасці з ідэаламі і каштоўнасцямі, якія ўласцівы пэўнаму грамадству, навакольнаму асяроддзю, групе. Узровень С. — вынік *выхавання* асобы.

САМАГОНАВАРЭ́ННЕ, хатні выраб самагону, брагі і інш. моцных спіртных напіткаў. Паводле кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адм. парушэннях С., захоўванне і набыццё гэтых напіткаў, а таксама выраб і захоўванне прылад для С. — правапарушэнні, якія падлягаюць адм. адказнасці. Хатні выраб спіртных напіткаў пры дапамозе натуральнага браджэння (віны, наліўкі, настойкі) не з'яўляецца правапарушэннем. За С. накладаецца штраф у памеры да 5 мінім. заработных плат. Крымінальны кодэкс у рэдакцыі 1960 разглядаў С. як крымін. злачынства.

САМАДЗЕ́ЙНАЕ ВЫЯЎЛЕ́НЧАЕ І ДЭКАРАТЫ́ЎНА-ПРЫКЛАДНО́Е МАСТА́ЦТВА, аматарская творчасць у галіне жывапісу, скульптуры, графікі і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Займае важнае месца ў духоўным развіцці гра-

Да арт. **Самадзейнае выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. Г. Асіпкова. Песня. 1976.

Да арт. **Самадзейнае выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. В.Бусараў. Ганчар. 1984.

мадства як структурны элемент маст. культуры і сродак далучэння да яе шырокіх слаёў насельніцтва; эфектыўная форма фарміравання гарманічна развітой асобы. У адрозненне ад прафес. маст. творчасці менш звязана з маст.-вобразнымі і стылістычнымі традыцыямі эпохі, агульнапрынятымі, гістарычна сфарміраванымі канонамі; спалучае маст. формы фальклору, нар. і прафес. мастацтва. Існуе ў арганізаваных (студыі, клубы, гурткі пры палацах і дамах культуры, дамах рамёстваў, навуч. установах і інш.) і неарганізаваных формах.

На Беларусі найб. масавы характар набыло ў 1920-я г. У першыя гады сав. улады гурткі і студыі мелі пераважна агітацыйна-прапагандысцкую накіраванасць, ствараліся пры заводах і фабрыках, установах, часцях Чырв. Арміі. Многія мастакі-аматары ўдзельнічалі ў ажыццяўленні т.зв. Ленінскага плана манум. прапаганды, стваралі бюсты паліт. і грамадскіх дзеячаў, помнікі, якія ўслаўлялі свабодную працу, працавалі над афармленнем вуліц і плошчаў, агітпаяздоў, агітпараходаў, агітпавозак (агітпараход і агітпоезд на Гомельшчыне ў 1919, мінскі агітпоезд на Віцебшчыне ў 1934). Значная работа вялася па наладжванні навуч. працэсу ў галіне самадз. выяўл. мастацтва. У Гомелі ў 1919—21 працавалі студыя выяўл. мастацтва імя М.Урубеля (сярод яе выхаванцаў нар. мастак Расіі Г.*Ніскі*), студыя пры Чангарскай кавалерыйскай дывізіі, студыя скульптуры пад кіраўніцтвам Ф.Валяро. У 1920-я г. створаны студыі выяўл. мастацтва ў Мінску, Оршы, Полацку, Гарадку. На выстаўцы твораў С.в. і д.-п.м. (1919) экспанаваліся работы рамеснікаў і мастакоў Бабруйска. У 1920—30-я г. развіваліся пераважна разьба па дрэве, аплікацыя саломкай, размалёўка, вышыўка, лозапляценне, кераміка. У 1936 у Мінску адбылася выстаўка работ самадз. мастакоў, у 1937 і 1938 — выстаўкі самадз. і нар. маст. творчасці. Іх развіццю садзейнічалі створаныя ў канцы 1930-х г. дамы нар. творчасці (з 1979 навукова-метадычныя цэнтры нар. творчасці і культурна-асветнай работы).

Да арт. **Самадзейнае выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. М.Засінец. Маці. 1976.

Да арт. **Самадзейнае выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. Л.Трахалёва. Дзот. 1989.

Да арт. **Самадзейнае выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. С.Бык. Партрэты М.Багдановіча, Я.Коласа, Я.Купалы.

Да арт. **Самадзейнае выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. В.Жарнасек. У прадмесці Лепеля. 1978.

У Вял. Айч. вайну самадз. мастакі Беларусі актыўна ўдзельнічалі ў выданні і афармленні друкаваных і рукапісных падпольных перыядычных выданняў, змяшчалі ў іх партрэты нар. мсціўцаў, пейзажныя замалёўкі, сатыр. малюнкі. У канцы 1940-х—1950-я г. колькасць новых студый і гурткоў павялічылася, праводзіліся творчыя семінары самадз. мастакоў, актывізавалася выставачная дзейнасць. У 1947, 1952, 1959 адбыліся рэсп. выстаўкі самадз. і нар. мастацкай творчасці, у 1955 выстаўка на Дэкадзе бел. мастацтва і л-ры ў Маскве. Значнае месца ў творчасці мастакоў-аматараў займалі тэмы Вял. Айч. вайны, адраджэння нар. гаспадаркі, роднага краю. У 1960—70-я г. актывізавалася дзейнасць арганізацыйна-метадычных устаноў, створаны дамы маст. самадзейнасці (з 1978 дамы самадзейнай творчасці).

На развіццё С.в. і д.-п.м. на Беларусі значна паўплываў удзел самадз. мастакоў і майстроў дэкар.-прыкладнога мастацтва ў рэсп. і ўсесаюзных фестывальных выстаўках-конкурсах, прысвечаных розным знамянальным падзеям, рэсп. выстаўкі дзіцячай выяўл., дэкар.-прыкладной і тэхн. творчасці. Іх творчасці ўласцівы разнастайнасць манер і тэхніка-выканаўчых прыёмаў, актыўны пошук індывід. формы, шырыня жанравага тэматычнага дыяпазону, паўната адлюстравання жыцця. У драўлянай скульптуры значнае месца займалі фальклорныя матывы. Сярод вядомых майстроў С.в. і д.-п.м. Беларусі 1960—90-х г. І.Абравец, Т.Агафоненка, В.Альшэўскі, В.Аляксеенка, К.Арцёменка, Г.Асіпкова, Л.Бабровіч, П.Букасаў, В.Бусараў, С.Бык, Л.Галаенка, Н.Ганчарова, Г.Ганчаронак, П.Гатоўка, В.Гаўрылюк, Ф.Генкін, В.Гвоздзеў, П.Гольцаў, У.Гулякевіч, В.Дабраквашын, Ф.Дудо, М.Ерафееў, В.Жарнасек, І.Занковіч, М.Засінец, Л.Казачонак, С.Какшынскі, В.Кандраценка, І.Кішкурна, М.Корабаў, Дз.Крупеня, З.Ляйко, А.Міхеенка, М.Няхай, А.Пупко, В.Рудовіч, Л.Саланенка, В.Самойленка, С.Серак, Ф.Сухавіла, Дз.Сырамятнікаў, Б.Тарасенка, Л.Трахалёва, Дз.Цубер, С.Шаўроў, А.Шышанкоў і інш. У 1990-я г. ліквідаваны Рэсп. навукова-метадычныя цэнтры нар. творчасці і культурна-асветнай работы, у некат. раённых гарадах, гар. пасёлках, калгасах і саўгасах яны заменены дамамі (цэнтрамі) рамёстваў (на 2001 больш за 40). Лепшым самадз. студыям і клубам надаецца званне «народны» (гл. *Народныя студыі і клубы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*).

Р.Ф.Шаура.

САМАДЗЕ́ЙНАЕ МАСТА́ЦТВА, аматарская творчасць нар. мас у галіне выяўл. і дэкар.-прыкладнога, муз., тэатр., харэагр. і цыркавога мастацтваў, кінамастацтва, фатаграфіі і інш. Асаблівага росквіту дасягнула ў рэчышчы агульнай маст. культуры, адлюстроўваючы рост

эстэт. запатрабаванняў працоўных. Вытокі С.м. ў *народнай творчасці*. Існуе пераважна ў арганізаваных (самадз. калектывы пры палацах і дамах культуры, цэнтрах творчасці, навуч. установах і інш.) і неарганізаваных (асобныя мастакі, скульптары, фота- і кінааматары) формах. Пра развіццё асобных відаў гл. *Самадзейнае выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, Самадзейнае музычнае мастацтва, Самадзейнае харэаграфічнае мастацтва, Аматарскае кіно, Фотамастацтва, Народныя інструментальныя ансамблі, Народныя кансерваторыі, Народныя самадзейныя калектывы, Народныя студыі і клубы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, Народныя тэатры, Народныя хары, ансамблі, аркестры.*

САМАДЗЕ́ЙНАЕ МУЗЫ́ЧНАЕ МАСТА́ЦТВА, аматарская творчасць у галіне музыкі. Уключае індывід. і калект. выкананне вак. і інстр. музыкі, стварэнне аматарамі муз. твораў. Вытокі бел. муз. самадзейнасці ў быт. і абрадавых карагодах і гульнях, у валачобных, калядных і вясельных гуртах, якія рыхтаваліся загадзя. З 1830—40-х г. у гар. асяроддзі Беларусі пашыралася аматарскае музіцыраванне, ставіліся муз. спектаклі, у т.л. па першых вадэвілях і муз. камедыях С.Манюшкі, камерныя вечары і інш. У 2-й пал. 19 ст. яно набыло арганізаваныя формы (хары настаўніцкіх семінарый з 1864, *музычныя таварыствы* з 1880-х г.). Этапам у развіцці С.м.м. былі *беларускія вечарынкі* (з 1905), што наладжваліся муз.-драм. гурткамі. Найб. развіццё маст. самадзейнасць набыла з 1920-х г. У стварэнні рэпертуару для калектываў муз. самадзейнасці ўдзельнічалі прафес. кампазітары М.Анцаў, М.Чуркін, Я.Цікоцкі, М.Мацісон. У 1930-я г. для кіраўніцтва маст. самадзейнасцю ствараліся рэспубліканскія (1937) і абласныя (1939) дамы нар. творчасці. Актывізацыі самадз. калектываў, росту майстэрства іх удзельнікаў спрыялі рэсп. алімпіяды і агляды самадз. мастацтва. У шэрагу яркіх калектываў вылучаліся Азершчынскі, Падлескі, Прысынкаўскі, Тураўскі, Юравіцкі нар. хары.

У Вял. Айч. вайну амаль ва ўсіх партыз. фарміраваннях Беларусі існавалі ансамблі і агітбрыгады (гл. *Партызанская мастацкая самадзейнасць, Партызанскія песні*). Пасляваен. перыяд адзначаны разнастайнасцю тыпаў калектываў, ростам іх маст. ўзроўню. Побач з харамі і ансамблямі песні і танца з'явіліся аркестры, інстр. ансамблі, оперныя студыі. Для метадычнай і практычнай дапамогі самадз. калектывам побач з дамамі нар. творчасці (з 1979 навук.-метадычныя цэнтры нар. творчасці і культ.-асв. работы) ствараліся рэсп. (1968) і абл. дамы маст. самадзейнасці (з 1978 дамы самадз. творчасці). Кансультуюць калектывы, а часам і непасрэдна кіруюць імі прафес. музыканты. Абнаўляць і ўзбагачаць рэпертуар дапамагаюць рэгулярнае выданне зборнікаў, агляды цэнтрамі нар. творчасці. Вял. ролю ў павышэнні майстэрства калектываў і выканаўцаў С.м.м. адыгрываюць рэсп. і абласныя агляды, конкурсы, фестывалі, святы духавой, нар. музыкі, песні і інш. Лепшым самадз. муз. калектывам прысвойваецца ганаровае найменне «народны» (з 1960), дзіцячым — «узорны» (з 1978; гл. *Народныя хары, ансамблі, аркестры*). Сярод нар. (узорных) самадз. калектываў вылучаюцца: нар. хар. капэла настаўнікаў Брэсцкай вобл., нар. вак. ансамбль «Мілавіца» Брэсцкага гар. Дома культуры (ДК). узорная капэла хлопчыкаў і юнакоў Брэсцкага абл. Палаца культуры (ПК) прафсаюзаў, нар. гурт вандроўных музыкаў «Фэст» Баранавіцкага гар. ДК, нар. ансамбль старадаўняй музыкі «Кантраданс» Баранавіцкай дзіцячай муз. школы №3, нар. ансамбль нар. музыкі і песні «Палешукі» Іванаўскага раённага цэнтра культуры і нар. традыцый, нар. хор Лёзненскага раённага ДК Віцебскай вобл., нар. фалькл. ансамбль «Паазер'е» Пастаўскай дзіцячай муз. школы, нар. духавы аркестр Наваполацкага ПК вытв. аб'яднання «Нафтан», узорны ансамбль нар. музыкі «Жалейка» Віцебскага цэнтра нар. рамёстваў і мастацтваў «Задзьвінне», нар. хор Тураўскага сельскага ДК Жыткавіцкага р-на, нар. хор «Вязанка» Брылёўскага сельскага ДК Гомельскага р-на, Жлобінскі нар. духавы аркестр ПК рэсп. унітарнага прадпрыемства «Беларускі металургічны завод», нар. ансамбль нар. інстру-

Да арт. **Самадзейнае музычнае мастацтва**. Фальклорны ансамбль «Дударыкі» Мінскай нацыянальнай гімназіі № 14.

Да арт. **Самадзейнае музычнае мастацтва**. Ансамбль народнай музыкі «Скарбніца» г. Магілёў.

Да арт. **Самадзейнае музычнае мастацтва**. Народны ансамбль беларускай песні «Чарніца» Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў г. Мінск.

ментаў Гомельскага абл. Дома тэхнічнай і маст. творчасці, нар. ансамбль нар. музыкі і песні «Радуніца» Мазырскага раённага ДК, нар. фалькл. ансамбль «Сваякі» ПК рэсп. унітарнага прадпрыемства «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод», нар. ансамбль нар. музыкі і песні «Цырынскія музыкі» Цырынскага ДК Карэліцкага р-на, нар. ансамбль песні і танца «Ніва» Верцялішкаўскага цэнтр. ДК Гродзенскага р-на, нар. ансамбль нар. музыкі «Лявоны» Воранаўскага раённага ДК, нар. хар. ансамбль «Спадчына» Магілёўскага гар. цэнтра культуры і вольнага часу, нар. ансамбль нар. песні «Мілавіца» Мышкавіцкага сельскага ДК Кіраўскага р-на, нар. цымбальны аркестр Асіповіцкага раённага ДК, нар. хар. капэла Магілёўскага ДК аўтазавода імя С.Кірава, ансамбль нар. музыкі «Скарбніца» г. Магілёў, нар. фалькл. ансамбль «Крупіцкія музыкі» Крупіцкага цэнтра культуры Мінскага р-на, нар. ансамбль нар. музыкі «Спадчына» Дзяржынскага гар. ДК, нар. фалькл. ансамбль «Лаўнічанка» Лаўніцкага сельскага ДК Барысаўскага р-на, нар. ансамбль нар. песні «Ярыцы» Любанскага раённага цэнтра культуры, узорны фальклорны ансамбль «Калыханка» Міханавіцкага сельскага ДК Мінскага р-на, узорны духавы аркестр Вілейскай дзіцячай муз. школы, нар. духавы аркестр Жодзінскага ПК рэсп. унітарнага прадпрыемства «БелАЗ», нар. ансамбль бел. песні «Церніца» ПК і спорту чыгуначнікаў г. Мінск, нар. аркестр нар. інструментаў БДУ, нар. аркестр нар. інструментаў Бел. пед. ун-та, нар. цымбальны ансамбль «Ведрыца» Рэсп. цэнтра маст. творчасці навучэнскай моладзі, нар. ансамбль камернай музыкі «Рычэркар» Рэсп. ПК прафсаюзаў, нар. вак. ансамбль ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл «Памяць сэрца» Рэсп. ПК ветэранаў, нар. мужчынскі хор ПК «Аўтазаводзец», фалькл. ансамбль «Дударыкі» Мінскай нац. гімназіі №111 (з 2001 № 14) і інш. Сярод аўтараў песень і інстр. твораў: М.Вайцяхоўскі, Р.Галавасцікаў, В.Гарбатоўскі, У.Журовіч, П.Касач, М.Коньшын, М.Пятрэнка, М.Сірата, І.Сушко, Я.Ціхановіч, П.Шаўко, М.Шумілін, А.Шыдлоўскі, П.Шыдлоўскі, М.Шынкевіч, Л.Ячнеў і інш. З самадзейнасці пачалі свой творчы шлях нар. арт. СССР Л.Александроўская, Я.Глебаў, І.Жыновіч, нар. арт. Беларусі І.Балоцін, М.Дзянісаў, Ю.Семяняка, засл. арт. Беларусі С.Навіцкі, Х.Шмелькін, В.Шутава, засл. дз. маст. Беларусі І.Кузняцоў і інш. Лепшыя прадстаўнікі самадз. мастацтва ўвайшлі ў склад Дзярж. нар. хору Беларусі і Дзярж. нар. аркестра Беларусі. На 1.1.2001 у дзярж. установах культуры Беларусі 8043 вак.-хар. калектывы (у т.л. 2686 дзіцячых), 1059 інстр. (у т.л. 350 дзіцячых): у Брэсцкай 2057 (у т.л. 310 дзіцячых), у Віцебскай 1118 (у т.л. 144 дзіцячыя), у Гомельскай 1166 (у т.л. 153 дзіцячыя), у Гродзенскай 1100 (у т.л. 100 дзіцячых), у Магілёўскай 1263 (у т.л. 118 дзіцячых), у Мінскай 1329 (у т.л. 234 дзіцячыя). Павышэнню маст. ўзроўню рэпертуару і выканаўчага майстэрства садзейнічаюць фестывалі і конкурсы. Сярод сучасных буйных фестываляў на Беларусі: Міжнар. фестывалі нар. музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» (з 1991, г. Паставы Віцебскай вобл.) і фестываль правасл. песнапенняў (з 1995, Мінск), рэсп. фестываль духавой музыкі «Беларускія фанфары» (з 1996, г. Баранавічы Брэсцкай вобл.), у т.л. рэгіянальныя «Дняпроўскія галасы» (г. Дуброўна Віцебскай вобл.), «Берагіня» (з 1999, г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл.). Сярод навуч. устаноў, якія рыхтуюць кіраўнікоў калектывамі: муз. і маст. вучылішчы рэспублікі, Бел. ун-т культуры, Бел. АМ, Бел. пед. ун-т.

Г.І.Цітовіч, А.А.Скарына.

САМАДЗЕ́ЙНАЕ НАСЕ́ЛЬНІЦТВА, частка насельніцтва, якая мае самаст. крыніцу сродкаў на існаванне (напр., даходы ад працы, пенсіі), таксама прадпрымальнікі, землеўладальнікі, трымальнікі каштоўных папер і інш. У наш час паняцце «С.н.» ў статыстыцы заменена паняццем *эканамічна актыўнае насельніцтва.*

САМАДЗЕ́ЙНАЕ ХАРЭАГРАФІ́ЧНАЕ МАСТА́ЦТВА, аматарская творчасць у галіне харэаграфічнага мастацтва (гл. *Харэаграфія*). Вядома ў многіх краінах свету. Вытокі бел. С.х.м. ў нар. абрадах і гульнях, карагодах. Да пач. 20 ст. развівалася ў рэчышчы муз. і тэатр. самадзейнасці. У 1900—20-я г. нар. танцы ў выкананні аматараў уключаліся ў праграмы *беларускіх вечарынак*, вял. значэнне мела дзейнасць *Першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага*, у канцэртных праграмах якой выконваліся многія нар. танцы. Найб. пашырылася з 1920-х г. з пачаткам сістэм. вывучэння і практычнага выкарыстання нац. харэагр. фальклору ў прафес. і аматарскіх калектывах. У рэпертуар танц. гурткоў уключаліся папулярныя ў народзе танцы, якія выконваліся ў іх фалькл. выглядзе. Паступова выпрацоўваліся метады і спосабы сцэн. інтэрпрэтацыі ўзораў харэагр. фальклору. У 1927 арганізаваны адзін з першых самадз. харэагр. калектываў — *Ансамбль танца* Мінскага клуба КІМ пад кіраўніцтвам К.*Алексютовіча.* У яго рэпертуары былі памастацку апрацаваныя, трансфармаваныя ў адпаведнасці з патрабаваннямі сцэны танцы «Мяцеліца», «Таўкачыкі», «Юрачка», «Мікіта», «Лянок»; на аснове нар. песні створаны танец «Бульба», які набыў вял. папулярнасць у пастаноўцы І.Майсеева. У 1930-я г. створаны ансамбль песні і танца ў калгасе «Ленінскі шлях» Дзяржынскага р-на, танц. калектыў торфарцелі імя 16 партызан Пухавіцкага р-на, ансамбль песні і танца будаўнікоў Мінска і інш. У творчай практыцы калектываў бел. танец набыў больш яркую сцэн. форму. Пасля Вял. Айч. вайны адноўлены раней створаныя самадз. танц. калектывы і ўзнікла шмат новых, сярод якіх пераважалі ансамблі танца і ансамблі песні і танца: з 1945 — нар. ансамбль танца «Крыжачок» БДУ; з 1954 — узорны ансамбль песні і танца «Прыбужжа» СШ №5 г. Брэста (засн. і маст. кіраўнік засл. настаўніца Беларусі В.Верамюк), з 1956 — нар. ансамбль танца «Вясёлка» Рэсп. Палаца культуры (ПК) прафсаюзаў (кіраўнік засл. работнік культ. Беларусі В.Ямінскі), з 1958 — узорныя ансамблі танца «Равеснік» Рэсп. ПК прафсаюзаў (з 1999 кіраўнік Т.Зубік) і «Лянок» прадпрыемства «Культсэрвіс» Мінскага трактарнага з-да (засн. Г.Чысцякова, з 1990-х г. кіраўнік І.Чысцякоў), з 1961 — узорны вак.-харэагр. ансамбль «Зорка» культурна-дзелавога цэнтра «КІМ» г. Віцебска (кіраўнік Н.Чарнюк). У 1960—80-я г. ўзніклі новыя самабытныя калектывы, выраслі іх масавасць і выканальніцкі ўзровень, іх цікавасць да нац. фальклору. Уклад у развіццё С.х.м. зрабілі нар. артысты Беларусі М.Бяльзацкая, А.Нікалаева, А.Рыбальчанка, А.Вараб'ёў, Я.Штоп, засл. артысты Беларусі М. і Р. Красоўскія, засл. дз. культ. Беларусі С.Грабеншчыкоў, М.Кіракозаў, Л.Ляшэнка, І.Серыкаў, М.Чысцякоў, В.Партной, Н.Залеўская, засл. работнікі культ. Беларусі Л.Барадулька, М.Лапша, І.Смірноў, Р.Чарахоўская, Ч.Клячко, а таксама Л.Тушынскі, З.Чарняўскі, А.Быковіч і інш. Лепшым дарослым і дзіцячым ка-

Да арт. **Самадзейнае харэаграфічнае мастацтва**. Народны ансамбль танца «Пінская шляхта» Пінскага вучылішча мастацтваў.

лектывам нададзены адпаведна найменні «народны» (з 1960) і «ўзорны» (з 1978) (гл. *Народныя самадзейныя калектывы; Народныя хары, ансамблі, аркестры*). У 1990-я г. ў самадз. мастацтва прыйшло шмат таленавітых балетмайстраў, пад кіраўніцтвам якіх створаны новыя калектывы з арыгінальным рэпертуарам: нар. ансамбль танца «*Крупіца*» Крупіцкага цэнтра культуры Мінскага р-на (з 1982; кіраўнік засл. работнік культуры Г.Чорны); нар. вак.-харэагр. ансамбль «Гомій» Гомельскага гар. цэнтра культуры (з 1982; кіраўнік засл. работнік культ. П.Свярдлоў); нар. харэагр. ансамбль «*Рунь*» Дома культуры (ДК) тэкстыльшчыкаў Магілёўскага прадпрыемства «Магатэкс»; нар. ансамбль танца «Белая Русь» Рэсп. цэнтра маст. творчасці навучэнцкай моладзі «Юнацтва» (з 1989; кіраўнік А.Карпогілёўскай 404 (з іх 321 дзіцячых), у Мінскай 539 (з іх 448 дзіцячых), сістэмы Федэрацыі прафсаюзаў — 68, сістэмы Мін-ва адукацыі — 32 калектывы. Адметная рыса творчай дзейнасці лепшых аматарскіх калектываў — выкарыстанне нац. харэагр. фальклору ў самых розных формах сцэн. інтэрпрэтацыі: ад традыц. ў жанры нар.-сцэн. танца да фольк-мадэрна. Плённае развіццё дзіцячай харэагр. самадзейнасці найперш звязана з масавым адкрыццём дзіцячых харэагр. школ і школ мастацтваў. Сярод лепшых дзіцячых калектываў узорны вак.-харэагр. ансамбль «Камарыкі» ПК вытв. аб'яднання «Нафтан» г. Наваполацк (з 1970; кіраўнік Клячко; у 1983 лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў); узорны ансамбль танца «Светлячок» ДК энергетыкаў г. Новалукомль (з 1977; кіраўнік Н.Тамашава; у 1998 лаўрэат міжнар. фестывалю маст. творчасці народаў СНД); узорны ансамбль танца «Лялечкі» Абухаўскага цэнтр. ДК Гроца, у іх ліку «Гарэзлівыя агеньчыкі» Мінскага ПК і спорту чыгуначнікаў (з 1979; кіраўнік В.Буры; у 1997 і 2001 лаўрэат фестываляў нар. творчасці Мінска «Сузор'е»); ансамблі бальнага танца, у іх ліку ансамбль «Мара», прадпрыемства «Культсэрвіс» Мінскага трактарнага з-да (з 1966; кіраўнік засл. работнік культ. Беларусі Л.Лазарава; у 1994, 1997, 2001 лаўрэат фестываляў нар. творчасці Мінска «Сузор'е»). Выяўленню самабытных калектываў і выканаўцаў, павышэнню маст. ўзроўню іх рэпертуару і выканальніцкага майстэрства, папулярызацыі танц. мастацтва садзейнічаюць фестывалі і конкурсы ў галіне харэагр. мастацтва, якія стымулююць развіццё існуючых і стварэнне новых калектываў розных жанраў: Міжнар. фестывалі харэаграфіі «Сожскі карагод» у Гомелі і сучаснай харэаграфіі «IFMC» у Віцебску; фестываль фальклору «Пінскі карагод»; абласны фестываль «Свята танца» ў Гродне; фестывалі

Да арт. **Самадзейнае харэаграфічнае мастацтва**. Узорны ансамбль танца «Зубраня» Палаца культуры «Аўтазаводзец» г. Мінск.

Да арт. **Самадзейнае харэаграфічнае мастацтва**. Народны ансамбль танца «Белая Русь» Рэспубліканскага цэнтра мастацкай творчасці навучэнцкай моладзі «Юнацтва».

віч; лаўрэат у 1997 І Міжнар. фестывалю харэаграфіі «Сожскі карагод»; у 1994, 1997, 2001 фестываляў нар. творчасці Мінска); нар. ансамбля танца «Пінская шляхта» Пінскага вучылішча мастацтваў (з 1992; кіраўнік В.Жыльцоў); нар. ансамбль-майстэрня абрадавай творчасці «Спас» Мінскага вучылішча мастацтваў (з 1995; кіраўнік В.Ямпольскі; у 1999 лаўрэат ІІ Міжнар. фестывалю харэаграфіі «Сожскі карагод») і інш.

У наш час С.х.м. — шматжанравая галіна маст. культуры. Яна ўключае ансамблі і студыі нар. класічнага, эстр., бальнага танца: калектывы сістэмы мін-ваў культуры, адукацыі, Федэрацыі прафсаюзаў Беларускай. На 1.1.2001 у дзярж. установах культуры Беларусі налічваецца 2575 самадз. харэагр. калектываў, з іх 2044 дзіцячых, у т.л. па абласцях: у Брэсцкай 397 (з іх 333 дзіцячых), у Віцебскай 432 (з іх 354 дзіцячых), у Гомельскай 533 (з іх 346 дзіцячых), у Гродзенскай 279 (з іх 242 дзіцячых), у Мадзенскага р-на (з 1978; кіраўнік Н.Урукіна); узорны ансамбль танца «Весялушкі» ДК чыгуначнікаў г. Орша (з 1981; кіраўнік І.Стамінская; у 1999 лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў); узорны ансамбль «Весялушка» Мінскай дзіцячай харэагр. школы (з 1981; кіраўнікі С. і І. Дарохіны; у 1995 лаўрэат Міжнар. фестывалю «Голас дзяцінства»); узорны ансамбль танца «Зубраня» ПК «Аўтазаводзец» г. Мінск (з 1983; кіраўнік Я.Гутман; у 1994, 1997, 2001 лаўрэат фестываляў нар. творчасці Мінска «Сузор'е»); узорны ансамбль танца «Жавароначкі» ПК т-ва «Сукно» Мінска (з 1985; кіраўнік С.Аляксандраў; у 1994 лаўрэат фестывалю нар. творчасці Мінска); узорны ансамбль танца «Чабарок» мінскага Палаца дзяцей і моладзі (з 1987; кіраўнік Н.Дзягель; у 1994 і 1997 лаўрэат фестываляў нар. творчасці Мінска); узорны харэагр. ансамбль танца «Раўніца» СШ №2 г. Барысаў (кіраўнік А.Цюцюноў) і інш. Значных поспехаў дасягнулі ансамблі эстр. танцдзіцячых і юнацкіх танц. калектываў «Танцуючы Фламінга» ў Гомелі і інш. Праводзяцца агляды самадз. харэагр. калектываў у рамках розных форумаў, прысвечаных нар. творчасці, у т.л. фестывалі нар. мастацтва Беларусі «Беларусь — мая песня», нар. творчасці «Сузор'е», студэнцкай маст. творчасці «Студэнцкая вясна» і інш. Харэагр. калектывы — актыўныя ўдзельнікі фестываляў фальклору за мяжой. Кадры кіраўнікоў харэагр. калектываў (балетмайстраў, педагогаў-харэографаў) рыхтуюць у Бел. ун-це культуры (кафедра харэаграфіі), у вучылішчах мастацтваў (аддзяленні харэаграфіі) у Мінску, Віцебску, Гродне, Гомелі, Пінску, Магілёве.

С.В.Гуткоўская, Ю.М.Чурко.

САМАДЗЯРЖА́ЎЕ, манархічная форма праўлення ў Расіі, пры якой *цару* (з 1721 імператару) належалі вярх. правы ў заканадаўстве, кіраванні краінай, камандаванні арміяй і флотам. З сярэдзіны 16 ст. ў Расіі складвалася саслоўна-

прадстаўнічая манархія: цар правіў разам з *Баярскай думай*, для вырашэння найважнейшых пытанняў склікаліся *Земскія саборы*. З канца 17 ст. адбываўся пераход да абсалютнай манархіі (гл. *Абсалютызм*), якая зацвердзілася ў час праўлення *Пятра I* [1682—1725, аднаасобна правіў з 1696]. Пазіцыі С. аслаблены рэвалюцыяй 1905—07, у ходзе якой была створана заканад. *Дзяржаўная дума*. У ходзе *Лютаўскай рэвалюцыі 1917*, пасля адрачэння ад прастола *Мікалая II* і яго брата Міхаіла Аляксандравіча, С. спыніла існаванне.

САМАДУ́РАЎ Пётр Сямёнавіч (10.7.1908, г. Пяцігорск Стаўрапольскага краю, Расія — 26.1.1985), бел. геолаг і петрограф. Д-р геагр. н. (1964), праф. (1966). Скончыў Растоўскі ун-т (1937). У 1958—69 у Бел. НДІ глебазнаўства і аграхіміі. Навук. працы па лёсавых і лёсападобных пародах і глебах Беларусі і Украіны.

Тв.: У кн.: Почвообразующие породы и их роль в формировании почв БССР. Мн., 1962; Палево-подзолистые почвы Белоруссии // Свойства почв и их плодородие. Мн., 1967.

САМАЗАБРУ́ДЖВАННЕ, натуральнае забруджванне навакольнага асяроддзя, выкліканае ўтварэннем небяспечных забруджвальнікаў пры фіз.-хім. працэсах або катастрафічных прыродных з'явах (вывяржэнне вулканаў, ураганы, паводкі, селевыя патокі і інш.), якія адбываюцца без прамога ўдзелу чалавека. Напр., з нетаксічных кампанентаў у прыродзе ўтвараецца ядавіты газ — фасген, з фрэонаў пры фотахім. рэакцыях у стратасферы — іон хлору, які разбурае азонавы слой. У вадаёмах за кошт адмірання расл. і жывёльных арганізмаў колькасць вуглекіслаты павялічваецца, растворанага кіслароду паменшаецца, утвараюцца ядавітыя для чалавека і жывёл рэчывы. Найб. прыкметна гэта выяўляецца ў перыяд ледаставу, а таксама ноччу летам пры моцным развіцці і адміранні мікраскапічных водарасцей. С. выклікае заморы рыб, гідрабіёнтаў. *П.І.Лабанок.*

САМАЗАГАРА́ННЕ, гл. ў арт. *Самаўзгаранне.*

САМАЗАРА́ДНАЯ ЗБРО́Я, *аўтаматычная зброя*, з якой выконваюцца толькі адзіночныя стрэлы. Адрозніваюць баявую, паляўнічую і спарт. С.з. (вядомы самазарадныя *пісталеты, вінтоўкі, карабіны* і *процітанкавыя ружжы*). З сучасных узораў на ўзбраенні армій і ў якасці паляўнічай і спарт. С.з. выкарыстоўваюць пісталеты і вінтоўкі (баявыя — у асн. снайперскія).

САМАЗВА́Л, спецыялізаваны *грузавы аўтамабіль*, кузаў якога можа перакульвацца назад, убок або назад і ўбок. Найб. пашыраны С. з кузавамі бункернага, каўшовага ці універсальнага тыпу з гідраўлічным механізмам (пад'ёмнікам) перакульвання, які прыводзіцца ў дзеянне ад рухавіка аўтамабіля. Ёсць С. з пнеўматычным, пнеўмагідраўлічным прыводам, з прымусовай разгрузкай матэрыялаў з дапамогай шнэка, самазвальныя *аўтапаязды* (з цягача і паўпрычэпа з доннай разгрузкай). Грузападымальнасць С. да 180 т і больш. Выкарыстоўваюцца на земляных работах, пры здабычы карысных выкапняў (кар'ерныя С.) і інш. На Беларусі розныя тыпы С. выпускаюць *Беларускі аўтамабільны завод* (гл. таксама *БелАЗ*), *Магілёўскі аўтамабільны завод, Мінскі аўтамабільны завод, Мінскі завод колавых цягачоў*. Гл. таксама *Думпер*.

САМАІНДУ́КЦЫЯ, з'ява ўзнікнення *электрарухальнай сілы* індукцыі ў праводным контуры пры зменах сілы току ў ім; асобны выпадак *электрамагнітнай індукцыі*. Напрамак эрс С. вызначаецца *Ленца правілам*, г.зн. пры павелічэнні сілы току ў ланцугу эрс С. перашкаджае яго нарастанню, а пры змяншэнні сілы току — яго спаданню.

Эрс С. прапарцыянальная скорасці змены сілы току: $\varepsilon = -Ldi/dt$, дзе L — *індуктыўнасць* контура. З С. вынікае, што пры далучэнні контура да крыніцы пастаяннага току найб. значэнне сілы току ўстанаўліваецца праз некаторы час, а пры адключэнні — эрс, якая ўзнікла, можа ў шмат разоў перавысіць эрс крыніцы току. У ланцугах пераменнага току ў выніку С. сіла току ў ланцугу з індуктыўнасцю адстае па фазе ад напружання на канцах шпулі на $\pi/2$. З'ява С. важная ў электра- і радыётэхніцы. Гл. таксама *Вагальны контур*.

САМАЙЛЮКО́ВІЧ Уладзімір Аляксандравіч (н. 17.4.1931, г. Пружаны Брэсцкай вобл.), бел. фізік і педагог, адзін з пачынальнікаў эксперым. даследаванняў паўправадніковых лазераў на Беларусі. Канд. фіз.-матэм. н. (1971), дац. (1978). Скончыў Брэсцкі пед. ін-т (1954). З 1964 у Ін-це фізікі АН Беларусі, з 1975 у БПА (у 1980—95 заг. кафедры). Навук. працы па оптыцы і лазернай фізіцы, даследаванні ўнутр. параметраў і асн. характарыстык інжэкцыйных паўправадніковых лазераў. Аўтар «Руска-беларускага фізічнага слоўніка» (1994; з У.Пазняком, А.Сабалеўскім) і навуч. дапаможнікаў для ВНУ.

САМАКІРАВА́ННЕ, самастойнасць якой-н. сац. супольнасці ў кіраванні ўласнымі справамі. С. адм.-тэр. адзінкамі (мясц. С.) ажыццяўляецца насельніцтвам праз прадстаўнічыя органы кіравання (муніцыпальныя сходы, саветы, камітэты і г.д.), адпаведныя органы кіравання (мясц. адміністрацыю), сходы грамадзян, мясц. рэферэндумы, інш. тэр. формы непасрэднай *дэмакратыі*, а таксама органы тэр. грамадскага С. насельніцтва. Органы мясц. С. звычайна не ўваходзяць у сістэму органаў дзярж. улады, але могуць надзяляцца законам асобнымі дзярж. паўнамоцтвамі, рэалізацыя якіх падкантрольная дзяржаве.

Узнікла разам з дзяржавай. Вядома ў рабаўладальніцкім і феад. грамадстве. На Беларусі пашырылася ў гарадах з увядзеннем *магдэбургскага права*. У дарэв. Расіі органамі С. былі гарадскія думы і земствы. Асаблівае значэнне С. набыло ў сувязі з бурж. рэвалюцыямі 17 ст. ў Англіі і 18 ст. ў Францыі, калі буржуазія ў барацьбе з абсалютызмам побач з інш. дэмакр. патрабаваннямі дамаглася ўдзелу народа ў мясц. кіраванні і права кантролю над ім. Гл. таксама *Веча, Муніцыпалітэт, Мясцовае кіраванне і самакіраванне, Мясцовыя Саветы дэпутатаў*.

САМАЛЁТ, а э р а п л а н, найбольш пашыраны цяжэйшы за паветра *лятальны апарат* для палётаў у атмасферы; асн. сродак *авіяцыі*. Адрозніваюць С.: грамадзянскія (пасажырскія, грузавыя і спец. прызначэння — санітарныя, сельс-

1

2

3

4

Самазвалы: 1 — МАЗ-525 (1950); 2 — «Волат» (Мінскага завода колавых цягачоў); 3 — МаАЗ-750516 (Магілёўскага аўтамабільнага завода); 4 — чатырохвосевы з пад'ёмнай сярэдняй воссю «Фрэйтлайнер» (ЗША).

кагаспадарчыя, для тушэння лясных пажараў, аэрафотаздымкі і інш.), ваенныя (*бамбардзіроўшчыкі, знішчальнікі, штурмавікі*, разведчыкі, ваенна-транспартныя і інш.), вучэбныя; поршневыя, турбавінтавыя, турбарэактыўныя і ракетныя; сухапутнага базіравання, карабельныя, *гідрасамалёты*, «*амфібіі*»; самалёты вертыкальнага ўзлёту, скарочанага і звычайнага ўзлёту і пасадкі; *манапланы* і *біпланы*; дагукавыя, звышгукавыя і гіпергукавыя. Найб. вядомыя С.: *аэробусы* («*Боінг*» і «*Канкорд*»), трансп. (грузавыя) «*Антэй*», «*Руслан*» і «Мрыя» (Ан-225, для перавозкі грузаў масай да 250 т, далёкасць палёту да 14,7 тыс. км).

Асн. часткі С.: планер (*крыло, фюзеляж, апярэнне, шасі*), сілавая ўстаноўка (складаецца з *авіяцыйных рухавікоў*, уваходных і выхадных устройстваў, сістэм кіравання, паліўнай і інш.), а таксама (для ваенных) узбраенне (пушачнае, ракетнае, бамбардзіровачнае). Сілавая ўстаноўка стварае цягу, а крыло пры наяўнасці паступальнай скорасці — *пад'ёмную сілу*. Для кіравання С. выкарыстоўваюць штурвальныя калонкі, ручкі кіравання, разнастайныя *навігацыйныя прылады* (у т.л. *авіягарызонты, аўтапілоты, аўташтурманы, вышынямеры*). У *навігацыі паветранай* і ў самім працэсе ваджэння С. (*самалётаваджэнні*) выкарыстоўваюцца сучасныя *навігацыйныя комплексы*, якія аб'ядноўваюць з дапамогай ЭВМ прылады і сістэмы С. з наземнымі *навігацыйнымі сістэмамі*. У ваен. С. выкарыстоўваецца прыцэльна-навігацыйная сістэма (складаецца з прыцэльнай, навігацыйнай, індыкатарнай і дальнамернай падсістэм). Для ўзлёту, пасадкі і абслугоўвання С. будуюць *аэрадромы* (звычайна ў складзе *аэрапорта*). Вытв-сцю С., авіяц. рухавікоў, абсталявання, бартавых сістэм і інш. займаецца *авіяцыйная прамысловасць*. Для палётаў на малой вышыні з выкарыстаннем экрануючага эфекту паверхні існуюць *экранапланы*, для заняткаў самалётным спортам — спец. спартыўныя С.

Канцэпцыю С. з раздзеленымі функцыямі нясучай паверхні (крыла) і рухальніка (вінта) прапанаваў у 1799 англ. вучоны і вынаходнік Дж.Кейлі. Патэнт на С. з парасілавой устаноўкай атрымаў у 1881 А.Ф.*Можайскі*, паставілі на С. рухавік унутр. згарання і ажыццявілі на ім першыя палёты ў 1903 браты *Райт* (гісторыю развіцця самалётабудавання гл. ў арт. *Авіяцыя*). Да канца 20 ст. створаны С. з макс. скорасцю больш за 3000 км/гадз, найб. вышынёй палёту больш за 30 км, далёкасцю палёту больш за 10 тыс. км, грузападымальнасцю да 250 т, пасажыраўмяшчальнасцю да 550 чал.

Літ.: История техники. М., 1962; Шульженко М.Н. Конструкция самолетов. 3 изд. М., 1971; Яковлев А.С. Советские самолеты. 4 изд. М., 1982; Андреев И. Боевые самолеты. М., 1981; Пономарев А.Н. Авиация настоящего и будущего. М., 1984; Житомирский Г.И. Конструкция самолетов. М., 1991.

С.М.Кузьменка, У.М.Сацута.

САМАЛЁТАВАДЖЭ́ННЕ, комплекс аперацый па кіраванні *самалётам*. Забяспечвае дакладнасць, надзейнасць і бяспеку палёту. Непасрэднае пілатаванне самалёта ажыццяўляецца чалавекам або комплексам бартавых аўтам. прыстасаванняў; бывае ручное, паўаўтаматычнае і аўтаматычнае. Манеўраванне самалётам у розных плоскасцях для выканання пэўных фігур наз. *пілатажам*. Метады, спосабы і сродкі С. распрацоўвае *навігацыя паветраная*. С. ажыццяўляецца па зямных арыенцірах, картах, з дапамогай компасаў, паказчыкаў скорасці, вышынямераў і інш. прылад, наземных *навігацыйных сістэм* і бартавых *навігацыйных комплексаў*, сродкаў *радыёнавігацыі* і *астранамічнай навігацыі*.

П.В.Мішанін.

САМАЛЁТНЫ СПОРТ, спаборніцтвы на самалётах; адзін з *тэхнічных відаў спорту*. Уключае спаборніцтвы на самалётах розных катэгорый з поршневымі, турбавінтавымі і рэактыўнымі рухавікамі на ўстанаўленне рэкордаў скорасці, вышыні, далёкасці, працягласці, хуткаўздымнасці і грузападымальнасці; спаборніцтвы на 1-месных спарт. і 2-месных вучэбных самалётах з поршневымі і рэактыўнымі рухавікамі па выкананні фігур вышэйшага *пілатажу* (у т.л. паветраная акрабатыка) у палётах прамым, абернутым, па крузе; у самалётаваджэнні па маршруце, удзень і ўначы.

Узнік у пач. 20 ст. Міжнар. авіяц. федэрацыя засн. ў 1905 (Парыж), Усерасійскі аэраклуб — у 1908 (Пецярбург). Чэмпіянаты свету па вышэйшым пілатажы праводзяцца з 1960 раз у 2 гады. Найб. развіты С.с. у Вялікабрытаніі, Германіі, ЗША, Расіі, Францыі, Швейцарыі і інш.

На Беларусі спаборніцтвы па С.с. праводзяцца штогод з 1949. Зборная каманда — сярэбраны прызёр 19-га асабіста-камандnага чэмпіянату СССР (1972). Сярод бел. спартсменаў найб. вызначыліся В.*Аўсянкін*, Т.*Перасекіна*, Я.*Фралоў*, В.*Яікава* і інш.

САМА́ЛІ, паўвостраў на У Афрыкі. Пл. каля 750 тыс. км^2. Абмываецца на Пн Адэнскім зал., на У і ПдУ Індыйскім ак. Большая ч. паверхні — ступеньчатыя плато (выш. 1000—1500 м), на Пн — горы (г. Шымбірыс, выш. 2416 м). Клімат субэкватарыяльны, на Пн — трапічны, засушлівы, у цэнтр. ч. — пустынны. Ападкаў 250—500 мм за год. На ПнЗ ва ўзвышанай ч. колькасць ападкаў павялічваецца (больш за 1000 мм за год). Рэкі — пераважна часовыя патокі, акрамя рэк Джуба і Уэбі-Шабеле. У далінах рэк галерэйныя рэдкалессі, на ўнутр. плато — тыповыя і апустыненыя саванны, а па схілах — лясы з дрэвападобных ядлоўцаў, на ўзбярэжжы акацыевыя паўпустыні. Качавая жывёлагадоўля, у аазісах вырошчваюць кукурузу, бананы, арахіс і інш. На тэр. паўвострава — дзяржавы Самалі, Джыбуці, усх. раёны Эфіопіі. Важнейшыя гарады і порты — Магадыша (Самалі), Джыбуці (Джыбуці).

М.В.Лаўрыновіч.

САМА́ЛІ (Soomaaliya), Самалійская Дэмакратычная Рэспубліка (Jamhuuriyadda Dimoqraadiga ee Soomaaliya), дзяржава на У Афрыкі. Мяжуе на ПнЗ з Джыбуці, на З з Эфіопіяй, на ПдЗ з Кеніяй. На Пн абмываецца Адэнскім зал., на У — Індыйскім акіянам. Пл. 627,7 тыс. км^2. Нас. 9,7 млн. чал. (2000). Дзярж. мовы — самалійская і арабская. Дзярж. рэлігія — іслам. Сталіца — г. *Магадыша*. Краіна падзяляецца на 18 абласцей. Нац. свята — Дзень незалежнасці (1 ліп.).

Дзяржаўны лад. С. — рэспубліка. Канстытуцыя 1960 ва ўмовах грамадз. вайны не выконваецца. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт. Заканад. орган — аднапалатны Нар. сход.

Прырода. Краіна займае большую ч. п-ва *Самалі*. У рэльефе пераважаюць ступеньчатыя плато (выш. 500—1500 м). На Пн асобныя горныя масівы, дзе ў масіве Суруд знаходзіцца г. Шымбірыс (2416 м). Карысныя выкапні: жал., уранавыя, ванадыевыя, тытанавыя, ніобіевыя, алавяныя руды, прыродны газ, соль і інш. Клімат субэкватарыяльны, сухі, на Пн трапічны. Сярэдняя т-ра ўсіх месяцаў 25—32 °С. Ападкаў ад 40 да 500 мм за год, выпадаюць пераважна ў крас.—чэрв., кастр.—снежні. Быва-



Самалёт: а — «Тып XI» Л.Блерыо, які зрабіў першы пералёт з Барака (Францыя) у англійскі Дуўр (1 — рухавік, 2 — цыліндры паветранага ахаладжэння, 3 — паліўны бак, 4 — бак для павелічэння пад'ёмнай сілы); б — «Боінг-747» (1 — кабіна экіпажа, 2, 4 — перадкрылкі, 3 — турбавентылятарныя рухавікі, 5 — закрылкі, 6 — пасажырскія месцы на 330 — 490 чал., 7 — стабілізатар са зменным вуглом устаноўкі, 8 — гідраўлічнае шасі, 9 — патрубак для запраўкі палівам).

юць шматгадовыя засухі. Рэкі — часовыя вадацёкі (акрамя Джубы і Уэбі-Шабеле). Больш за 90% тэр. — пустыня і паўпустыня з рэдкімі травамі і калючымі хмызнякамі; у аазісах фінікавыя пальмы. Ёсць участкі саваннаў, па берагах рэк — галерэйныя лясы. Характэрныя прадстаўнікі жывёльнага свету — антылопы, зебры, буйвалы, жырафы; паўсюдна — грызуны, змеі, яшчаркі і інш. Рэзерваты — Уэбі-Шабеле, Страусавы і інш.

Насельніцтва. С. — этнічна аднародная краіна, самалійцы складаюць 98—99%, падзяляюцца на плямёны. Жывуць невял. групы суахілі, арабаў, італьянцаў, англічан. Сярэднегадавы прырост больш за 4% за год. Сярэдняя шчыльн. 15,5 чал. на 1 км^2, на Пд месцамі да 50 чал. на 1 км^2, на Пн у пустынях і паўпустынях — 1—2 чал. на 1 км^2. Каля 70% насельніцтва — качэўнікі і паўкачэўнікі. У гарадах 26% насельніцтва, найб. Магадыша (больш за 700 тыс. ж. з прыгарадамі, 2000), Кісмайо, Харгейса, Бербера, Марка. У сельскай гаспадарцы (пераважна пашавая жывёлагадоўля) заняты 71% эканамічна актыўнага насельніцтва, у прам-сці і сферы паслуг — 29%. У сувязі з грамадз. вайной каля 1 млн. чал. сталі бежанцамі, жывуць у лагерах, часткова на тэр. суседніх краін.

Гісторыя. Чалавек насяляе тэр. С. з часоў палеаліту. З 7 ст. н.э. С. ў зоне ўплыву арабамусульм. цывілізацыі, паступова тут пашыраўся *іслам*. На ўзбярэжжы ўзніклі буйныя гарады Барбара (Бербера), Магадыша, Бараўэ (Брава), Марка і інш. Унутр. раёны насялялі шматлікія плямёны самалі, якія не мелі ўстойлівых дзяржаў. утварэнняў. З канца 15 ст. ў С. пранікалі партугальцы, якія падпарадкавалі прыбярэжныя гарады. У 17 ст. іх выгналі туркі, якія сталі кантраляваць гарады на Пн С.; Пд С. ўвайшоў у сферу ўплыву Амана. У выніку калан. экспансіі ў канцы 19 ст. тэр. рассялення самалійскіх плямён падзелена на некалькі частак: паўн. раёны адышлі да Вялікабрытаніі як пратэктарат Самалілэнд, паўд. і ўсх. — да Італіі як Італьян. С., зах. раёны (Агадэн) — да Эфіопіі. У 2-ю сусв. вайну Італьян. С. ў 1941 занята брыт. войскамі. У 1949 ААН перадала б. Італьян. С. пад апеку Італіі на 10 гадоў. 21.6.1960 абвешчана незалежнасць Самалілэнда, 1.7.1960 — Італьян. С.; у той жа дзень абое С. аб'яднаны ў адзіную Самалійскую Рэспубліку. Унутр. становішча дзяржавы было нестабільнае. Пасля забойства першага прэзідэнта А.А.Шэрмарка (1969) уладу захапілі ваенныя на чале з ген. М.С.Барэ, які ўзначаліў Вярх. рэв. савет; была абвешчана Самалійская Дэмакр. Рэспубліка. Урад Барэ абвясціў курс на пабудову сацыялізму: нацыяналізаваны банкі, буйныя прадпрыемствы, праведзены інш. захады сацыяліст. характару, наладжаны цесныя сувязі з СССР. Адзінай дазволенай партыяй стала створаная ў 1976 Самалійская рэв. сацыяліст. партыя на чале з Барэ. Вайна 1977—78 з Эфіопіяй за прав. Агадэн, у якой СССР падтрымаў Эфіопію, прывяла да разрыву з СССР і пераарыентацыі С. на ЗША.

Пагаршэнне эканам. становішча С. разам з абвастрэннем міжплемянных супярэчнасцей прывяло ў канцы 1980-х г. да ўзбр. выступленняў супраць рэжыму Барэ, які ў 1991 быў вымушаны пакінуць краіну. С. стала арэнай барацьбы ўзбр. груповак (Самалійскі нац. альянс, Самалійскі альянс выратавання і інш.) за ўладу. Некат. раёны (у прыватнасці, б. Самалілэнд) абвясцілі сябе незалежнымі дзяржавамі. У 1992—95 узбр. сілы ЗША і іх саюзнікаў па НАТО правялі ў С. пад эгідай ААН 2 спец. аперацыі з мэтай выратавання насельніцтва ад голаду і пошуку шляхоў унутрыпаліт. ўрэгулявання, якія мелі частковы поспех. У 2000 у Джыбуці праведзена канферэнцыя асн. паліт. сіл С., на якой створаны часовы парламент краіны; часовым прэзідэнтам С. выбраны А.С.Хасан. Аднак іх улада прызнаецца толькі на ч. тэр. краіны, аднаўленне дзярж. адзінства застаецца актуальным пытаннем. С. — чл. ААН (з 1960), Арг-цыі афр. адзінства (з 1963).

Герб і сцяг **Самалі**.

Шматгадовая грамадз. вайна выклікала заняпад гаспадаркі, памяншэнне пагалоўя жывёлы, скарачэнне пасяўных плошчаў і колькасці прадпрыемстваў, інфраструктура амаль цалкам разбурана. Штогадовы даход на 1 чал. каля 600 дол. (1999). Сельская гаспадарка і рыбалоўства даюць каля 60% прыбыткаў краіны, прам-сць — каля 11%, сфера паслуг — 29%. Гал. галіна сельскай гаспадаркі — качавая жывёлагадоўля. Пад пашай каля 400 тыс. км^2 — тэр. паўпустынь і саваннаў. У краіне каля 3—5 млн. вярблюдаў, 5 млн. галоў буйн. раг. жывёлы, 13 млн. авечак, 12 млн. коз. Птушкагадоўля. Пад пасевамі с.-г. культур каля 1,2 млн. га, з іх 180 тыс. га арашаецца. Земляробчыя гаспадаркі памерам да 3 га, на арашальных землях — да 1 га; ёсць плантацыі экспартных культур. Асн. земляробчы раён на Пд, у далінах і міжрэччы рэк Джуба і Уэбі-Шабеле. Асн. культуры (збор у пач. 1990-х г.): сорга і проса (каля 240 тыс. т), кукуруза (каля 255 тыс. т), цукр. трыснёг (каля 310 тыс. т), рыс (каля 13 тыс. т), бананы (каля 125 тыс. т), бавоўнік, маніёк, батат, арахіс, кун-

Да арт. **Самалі**. Узбярэжжа Індыйскага акіяна.

жут, бабовыя. Трапічнае арашальнае садоўніцтва, на ўзбярэжжы гаі какосавых пальмаў. Рыбалоўства ў прыбярэжных водах (каля 15 тыс. т штогод). Каля 65% сусв. збору араматычных смол (камедзі, міры, ладану) з дзікарослых раслін. Паляўніцтва. Прам-сць развіта слаба. Ёсць каля 200 прадпрыемстваў апрацоўчай прам-сці, каля палавіны іх знаходзіцца ў Магадыша — нафтаперапр. з-д, харч., гарбарна-абутковыя, метала- і дрэваапр., суднабуд. і суднарамонтныя. Працуюць: цукр. з-д, мясакамбінаты, рыбакансервавыя і малочныя з-ды, тэкст., абутковыя і бавоўнаачышчальныя ф-кі. На Пн здабыча ніобіевых руд і кухоннай солі. Развіта саматужна-рамесніцкая вытв-сць (цэнтр — г. Кісмайо): ткацтва, разьба па дрэве, кераміка, пляценне, выраб скур і інш. Вытв-сць электраэнергіі 258 млн. кВт · гадз (1996) на невял. цеплавых электрастанцыях. Транспарт пераважна аўтамаб. і марскі, ва ўнутр. раёнах — уючны. Даўж. аўтадарог 22,1 тыс. км, у т.л. з цвёрдым пакрыццём — 2,6 тыс. км. Гал. парты Бербера, Кісмайо і Магадыша. У краіне 61 аэрапорт, у т.л. 7 з цвёрдым пакрыццём лётнага поля. У 1995 экспарт склаў 123 млн. дол., імпарт — 60 млн. дол. У экспарце пераважаюць жывёла і прадукты жывёлагадоўлі (каля 88%), бананы (8%), рыба і рыбапрадукты; у імпарце — разнастайныя прамысл. і харч. тавары, нафта і нафтапрадукты. Гал. гандл. партнёры: Саудаўская Аравія, Емен, Італія, Кенія, Джыбуці. Краіна штогод атрымлівае фін. і харч. дапамогу ад міжнар. арг-цый і асобных краін (Саудаўскай Аравіі, Вялікабрытаніі, Італіі і інш.). Грашовая адзінка — самалійскі шылінг.

К.А.Анціпава (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *В.У.Адзярыха* (гісторыя).

САМАЛІЙСКАЕ ЦЯЧЭ́ННЕ, паверхневае цячэнне ў паўн.-зах. ч. Індыйскага ак., каля ўсх. берагоў п-ва Самалі (Афрыка). Выклікана мусоннымі вятрамі і мае сезонную змену напрамку. Зімой рухаецца на Пд—ПдЗ, на Пд ад экватара пераходзіць у Міжпасатнае (экватарыяльнае) супрацьцячэнне; т-ра вады 25—26 °С, скорасць 0,9—1,8 км/гадз. Летам накіравана на Пн—ПнУ, з'яўляецца зах. працягам Паўд. пасатнага цячэння; т-ра вады зніжаецца да 21—25 °С, скорасць 1,8—2,7 км/гадз і болей.

САМАНАВУЧА́ЛЬНАЯ СІСТЭ́МА, разнавіднасць самапрыстасавальных сістэм, алгарытм функцыянавання якой пад уплывам знешніх умоў аўтаматычна змяняецца ў адпаведнасці з зададзеным крытэрыем якасці. Асаблівасць С.с. — удасканаленне алгарытму адбываецца ў самой сістэме на аснове ранейшага вопыту работы без паступлення знешняй навучальнай інфармацыі. Гл. таксама *Самаарганізавальная сістэма, Самапрыстасавальны робат.*

САМАНАЗІРА́ННЕ, назіранне, аб'ектам якога з'яўляюцца псіхічны стан і дзеянні самога суб'екта. Узнікае ў працэсе зносін з інш. людзьмі, засваення сац. вопыту і сродкаў яго асэнсавання. Адыгрывае значную ролю ў фарміраванні самасвядомасці і самакантролю асобы. Ужывалася ў эмпірычнай псіхалогіі 18—19 ст. У сучаснай псіхалогіі С. ўлічваецца як факт, які патрабуе навук. тлумачэння.

САМАНАПРУ́ЖАНЫЯ КАНСТРУ́КЦЫІ, жалезабетонныя канструкцыі, у якіх узнікае напружаны стан у працэсе цвярдзення бетону, прыгатаванага з т.зв. напружвальных (расшыральных) цэментаў; разнавіднасць *папярэдненапружаных канструкцый*.

Пры цвярдзенні спецыяльна прыгатаванага бетону адбываецца яго аб'ёмнае расшырэнне, напружваецца ўся арматура, жалезабетон самаўшчыльняецца і набывае значную трываласць (на 25—30% большую, чым пры цвярдзенні без арматуры), вільгаце- і газанепранікальнасць. Пры вырабе С.к. на з-дах іх падвяргаюць і цеплавільготнаснай апрацоўцы. Выкарыстоўваюцца пры буд-ве напорных труб, рэзервуараў, элементаў дарожных і аэрадромных пакрыццяў, тунэляў, гідратэхн. збудаванняў.

САМАНІ́ДАЎ ДЗЯРЖА́ВА, дзяржава ў Цэнтр. Азіі са сталіцай у г. *Бухара* ў 9—10 ст. Узнікла ў выніку распаду Арабскага халіфата (9 ст.), калі ўладу ў *Мавераннахры* і *Харасане* захапілі намеснікі з роду Саманідаў. Канчаткова склалася пры Ісмаіле Самані [874—907], які ў 892 абвясціў сябе незалежным эмірам. У перыяд росквіту ўключала Мавераннахр, Харасан, Паўн. і Усх. Іран; у васальнай залежнасці ад С.дз. былі Гарган, Сістан, Чаганіян, Табарыстан (Мазендэран) і інш. Саманіды імкнуліся стварыць цэнтралізаваную дзяржаву з суцэльнай сістэмай адм. улады і моцным войскам. У гэты час назіраўся ўздым Бухары, Самарканда, Нішапура, Мерва, Ургенча, Герата як буйных цэнтраў рамяства і гандлю. Саманіды падтрымлівалі навукі і мастацтва, пры іх дварэ працавалі паэты, пісьменнікі, вучоныя, што спрыяла станаўленню новай мусульм.-перс. л-ры і фарміраванню сучаснай перс. мовы (фарсі). З сярэдзіны 10 ст. пачаўся заняпад С.дз., якая спыніла сваё існаванне пасля захопу ў 999 Бухары цюркамі. С.дз. адыграла важную ролю ў этнагенезе таджыкаў.

САМАПА́Л, р у ч н і ц а, ручная *пішаль* з мех. прыстасаваннем для запальвання зарада (гл. *Замок*).

«САМАПО́МАЧ», кааператыўна-гаспадарчы часопіс. Выдаваўся ў кастр. 1932 — чэрв. 1939 у Вільні на бел. мове. Рэдактар А.Клімовіч. Рэдакцыя прапагандавала ідэі вытв. і спажывецкай кааперацыі, аказвала арганізац.-практычную дапамогу сялянам у сац. абароне, павышэнні культуры земляробства, гаспадарання ў цэлым. У перадавіцах «У чым сіла кааперацыі?», «Нам патрэбна школа працы», «Жыць хочам і будзем жыць», у публікацыях «Як залажыць кааператыў», «Методыка кааперацыі» і інш. матэрыялах аб каап. руху ў Балгарыі, Чэхаславакіі, Літве засяроджвалася ўвага на вопыце і ўзорах каап. працы, даваліся практычныя парады па арганізацыі каап. дзейнасці, гучаў заклік да грамадскай салідарнасці. Часопіс друкаваў матэрыялы з розных рэгіёнаў Зах. Беларусі, у якіх удзельнікі каап. руху дзяліліся здабыткамі сваіх арганізацый, інфармавалі пра перашкоды і недахопы ў іх працы. Вял. ўвагу аддаваў задачам аб'яднання бел. кааператываў пад кіраўніцтвам аднаго бел. цэнтра. У раздзеле «Сельская гаспадарка» з агранамічнымі парадамі па культуры земляробства, садоўніцтва, пчалярства выступалі Клімовіч, Л.Войцік (З.Верас), М.Караленка, С.Яновіч. На старонках часопіса ўзнімаліся пытанні стану бел. асветы і адукацыі. Выйшлі 92 нумары. *А.С.Ліс.*

САМАПРЫСТАСАВА́ЛЬНЫ РО́БАТ, а д а п т ы ў н ы р о б а т, від *робатаў*, здольных актыўна і мэтанакіравана ўзаемадзейнічаць са знешнім асяроддзем у розных абставінах. Маюць тэхн. сродкі рэагавання на фактары неакрэсленасці абставін, якія дазваляюць прыстасоўваць да іх свае дзеянні пры выкананні пэўнай работы.

Сістэма кіравання С.р. мае дадатковы контур сігналаў інфармацыі з датчыкамі, адчувальнымі да ўласцівасцей знешняга асяроддзя, якія змяняюцца ў працэсе работы ці папярэдне не зададзены. Сігналы ад датчыкаў паступаюць у сістэму кіравання робата для аўтам. змен праграмы яго дзеянняў. Магчымасць аператыўнай пераналадкі кіравальных праграм дазваляе С.р. вырашаць большасць задач, недасягальных жорсткапраграмаваным робатам. Напр., калі *прамысловы робат* павінен узяць дэталь, якая ляжыць не ў зададзеным месцы, ён удакладняе сапраўднае яе месцазнаходжанне і вызначае свае дзеянні, а пры жорсткай праграме дзеянняў робат не зможа яе ўзяць. Большасць распрацовак С.р., у т.л. прамысловых, вядзецца з н.-д. мэтамі.

А.В.Самойленка.

СА́МАР (Samar), гарысты востраў у цэнтр. ч. Філіпінскага архіпелага. Пл. 13,4 тыс. км² (з прылеглымі дробнымі астравамі). Горы, выш. да 896 м, складзены пераважна з крышт. пародаў, слянцаў і вапнякоў. Уздоўж узбярэжжаў — алювіяльныя нізіны, у прыбярэжнай зоне — каралавыя рыфы. Клімат трапічны, мусонны. Ападкаў 2500—3500 мм за год, у кастр.—снеж. частыя тайфуны. Вільготныя трапічныя лясы. Радовішчы медных руд. Вырошчванне какосавай пальмы, абакі, рысу, кукурузы. Асн. гарады — Кальбаёг, Катбалоган, Катарман. Злучаны паромам з в-вам *Лусон*, мостам з в-вам Лейтэ.

САМА́РА, горад у Іраку, на левым беразе р. Тыгр (мухафаз Багдад). Заснаваны ў 836 на месцы стараж. паселішча як рэзідэнцыя *Абасідаў*. Пасля пераносу халіфам Мутамідам (870—892) сталіцы халіфата ў Багдад С. заняпала. У 1911—13 ням. археолаг Э.Герцфельд даследаваў руіны стараж. горада: рэгулярныя ў плане грандыёзныя палацы з садамі, мячэці, маўзалеі, жылыя пабудовы (усе

з абпаленай цэглы, радзей сырцу). На правым беразе р. Тыгр — руіны замка Каср аль-Ашык (878—882) з 3 парадным палацамі і васьміграннага купальнага маўзалея Кубат ас-Сулайбія. У С. знойдзены сюжэтныя і арнаментальныя размалёўкі, разны стук, мастацкая люстравая кераміка і інш.

САМА́РА, горад, цэнтр Самарскай вобл. Расіі. 1156 тыс. ж. (2000). Порт на р. Волга, пры ўпадзенні ў яе р. Самара. Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: машынабуд. і металаапр. (выт-сць авіякасм. тэхнікі, самалётаў, нафтавага абсталявання, матора-, станка-, прыладабудавання, радыёэлектронікі, тэлевізараў; з-ды падшыпнікавы, аўтатрактарнага электраабсталявання, аэрадромнага абсталявання, эл.-тэхн. і інш., нафтаперапр. і нафтахім., хім., металургічная, харчасмакавая (мяса- і тлушчакамбінаты, шакаладная ф-ка), лёгкая. Метрапалітэн (з 1987). ГРЭС. 10 ВНУ, у т.л. ун-т. 4 тэатры, у т.л. оперы і балета. Цырк. Філармонія. 5 музеяў, у т.л. краязн. і мастацкі.

Засн. ў 1586 як драўляная вартавая крэпасць Рас. дзяржавы ў новаадлучаных землях Паволжа. С. — адзін з цэнтраў нар. рухаў пад кіраўніцтвам С.Ц.*Разіна* (1670—71) і Е.І.*Пугачова* (1773—75). З 1708 у складзе Казанскай, з 1718 — Астраханскай губ. З 1780 павятовы горад Сімбірскага намесніцтва, з 1796 — Сімбірскай губ., з 1851 губернскі горад. У 1877 праз С. прайшла Арэнбургская чыгунка. У пач. 20 ст. (разам з Ніжнім Ноўгарадам і Саратавам) буйнейшы цэнтр па перапрацоўцы збожжа ў Расіі. З 1928 — цэнтр Сярэдняволжскай вобл., перайменаванай у Сярэдняволжскі край (1929), Куйбышаўскі край (1935). У 1935—91 наз. Куйбышаў. У Вял. Айч. вайну сюды былі эвакуіраваны ўрадавыя ўстановы з Масквы, пасольствы і прадстаўніцтвы замежных дзяржаў, прамысл. прадпрыемствы, у т.л. з Беларусі.

САМАРА́ДАЎ Аляксандр Сяргеевіч (2.2.1919, г. Красны Холм Цвярской вобл., Расія — 12.3.1998), бел. спявак (лірычны барытон). Засл. арт. Беларусі (1973). Скончыў Бел. кансерваторыю (1956, кл. Я.Віцінга). Творчую дзейнасць пачаў у 1940. У 1944—50 на парт. рабоце. З 1952 саліст Дзярж. акад. нар. хору Беларусі, у 1954—73 — Бел. дзярж. філармоніі, у 1976—92 артыст хору Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. У канцэртным рэпертуары творы рус. і замежнай класікі, арыі, рамансы і песні рас. і бел. кампазітараў, нар. песні.

САМАРАЗВІЦЦЁ, гл. ў арт. *Самарух*.

САМАРА́НЧ ТАРЭ́ЛЬЁ (Samaranch Torello) Хуан Антоніо (н. 17.7.1920, г. Барселона, Іспанія), іспанскі дзеяч міжнар. алімп. руху, дыпламат. Маркіз. Скончыў каледж у Германіі і Вышэйшы ін-т бізнесу ў Барселоне. З 1954 чл.Ісп. алімп. к-та (у 1967—70 яго старшыня), займаў пасаду міністра па справах моладзі і спорту ісп. ўрада. У 1973—77 старшыня муніцыпальнага савета Барселоны. У 1977—80 пасол Іспаніі ў СССР і Манголіі. З 1966 чл. Міжнар. алімп. к-та (МАК). У 1980—2001 прэзідэнт МАК. За гады свайго прэзідэнцтва ажыццявіў кардынальную перабудову алімп. руху, што выявілася ў прафесіяналізацыі *Алімпійскіх гульняў*, пераходу іх на камерцыйную аснову.

САМА́РАЎ (сапр. М а р к і н) Аляксей Максімавіч (19.8.1904, в. Кірылава Беднадзям'янаўскага р-на Пензенскай вобл., Расія — 29.11.1977), бел. і расійскі акцёр. Засл. арт. Беларусі (1963). Скончыў Цэнтр. тэхнікум тэатр. мастацтва ў Маскве (1929). Працаваў акцёрам і рэжысёрам тэатраў Уладзівастока, Масквы, Спаска, Хабараўска, у БДТ-2. У 1947—77 у Брэсцкім абл. драм. т-ры. Выканаўца характарных і камедыйных роляў. Лепшым работам уласцівы вастрыня пластычнага малюнка, дакладнасць сац. і псіхал. характарыстык, жыццёвая верагоднасць: Гарошка («Выбачайце, калі ласка!» А.Макаёнка), доктар Савіч («Сэрца на далоні» паводле І.Шамякіна), Муратаў («Зыкавы» М.Горкага), Жавакін («Жаніцьба» М.Гогаля), Гадзіншчык («Крамлёўскія куранты» М.Пагодзіна), Скамарох («Праз сто гадоў у бярозавым гаі» В.Карастылёва), доктар Эмет («Дзіўная місіс Сэвідж» Дж.Патрыка). *А.А.Лабовіч.*

САМАРКА́НД, горад, цэнтр Самаркандскай вобл. ва Узбекістане, у даліне р. Зераўшан. 400 тыс. ж. (1999). Чыг. вузел. Аэрапорт. Прам-сць: машынабудаванне (ліфты, кінаапаратура, быт. халадзільнікі, тэлевізары, кандыцыянеры і інш.), лёгкая (бавоўнаачышчальная, шаўкаткацкая), харчасмакавая (вінаробная, кансервавая, тытунёвая), хім. (мінер. ўгнаенні) і інш. 6 ВНУ, у т.л. ун-т. 4 тэатры. Музеі: гісторыі, культуры і мастацтва Узбекістана, горада, Улугбека, дом-музей *Айні*.

У 4 ст. да н.э. — 6 ст. н.э. на тэр. С. існаваў г. Мараканда, сталіца дзяржавы *Согд*, які пазней увайшоў у *Цюркскі каганат*. У 329 да н. э. заваяваны войскамі Аляксандра Македонскага. У пач. 8 ст. горад захапілі арабы. У 9—10 ст. пад уладай Саманідаў, у 11 ст. — Караханідаў, туркаў-сельджукаў, з сярэдзіны 12 ст. — каракітаяў. У пач. 13 ст. С. валодалі харэзмшахі. У 1220 разбураны мангола-татарамі. У канцы 14 — пач. 15 ст. сталіца імперыі *Цімура*. Пры *Улугбеку* пабудавана астранамічная абсерваторыя (1424—29). У той час С. — буйны эканам. і культ. цэнтр Сярэдняй Азіі. З 1500 у складзе дзяржавы Шэйбанідаў, якія



У цэнтры **Самары**.

Самара. Рачны вакзал.

Архітэктурны ансамбль Шахі-Зінда каля ўяўнай магілы Кусама ібн-Абаса ў **Самаркандзе**. 1334—35.

перанеслі сталіцу з С. ў Бухару. У канцы 16 ст. С. у складзе *Бухарскага ханства*. У 1868 заняты рас. войскамі і далучаны да Рас. імперыі, цэнтр Зераўшанскай акругі, з 1887 — Самаркандскай вобл. У 1899 злучаны чыгункай з Ташкентам. У 1924—30 С. — сталіца Узб. ССР, з 1938 абл. цэнтр. У Вял. Айч. вайну сюды эвакуіраваны шэраг прамысл. прадпрыемстваў.

У паўн.-ўсх. частцы С. гарадзішча *Афрасіяб*, ансамблі маўзалеяў Шахі-Зінда (11—12, 14—15 ст.), *Бібі-Ханым* з керамічным шматколерным дэкорам. У цэнтры старой ч. горада ансамбль плошчы Рэгістан (пачаў складвацца ў 12 ст.), які ўключае 3 медрэсэ (Улугбека, 1417—20; Шыр-Дор, 1619—35; Тыля-Кары, сярэдзіна 17 ст.) з багатым мазаічным і разным керамічным і мармуровым аздабленнем. На Пд ад плошчы — маўзалеі *Гур-Эмір*, Рухабад (1380-я г.), Аксарай (1470-я г.; мазаічны і сталактытавы дэкор); на ПдУ — руіны маўзалея Ішрат-хана (1464), мемар. комплекс каля маўзалея Хаджа Абды-Дарун (15 ст.). Сярод інш. помнікаў: абсерваторыя Улугбека (1428 ці 1429; рэшткі падмуркаў і секстант), маўзалей Чупан-Ата (15 ст.), медрэсэ Хаджа Ахрара (1630 ці 1631), мячэць Хазрэт-Хызр (на стараж. падмурку; 19 — пач. 20 ст., арх. Усто-Бакі, Усто-Абдукадыр) і інш. С. — цэнтр маст. рамёстваў.

Літ.: Пугаченкова Г.А. Самарканд. Бухара. 2 изд. М., 1968; Из истории искусства великого города. Ташкент, 1972.

І.Л.Чэбан (архітэктура).

Самарканд. Абсерваторыя Улугбека.

Плошча Рэгістан у **Самаркандзе**.

САМАРО́ДАК, прыроднае адасабленне самароднага металу (золата, радзей серабра, медзі, плаціны) масай больш за 1 г (зрэдку 10 мг) у карэнных і россыпных радовішчах. Найб. С. золата: «Пліта Холтэрмана» (93,5 кг, з залатаноснай пародай 285 кг), «Жаданы незнаёмец» (70,9 кг з кварцам; абодва ў Аўстраліі). С. серабра больш за 500 кг знойдзены ў Канадзе, скопішчы С. серабра з аргентытам (40 т) у Германіі; тыповымі з'яўляюцца гіганцкія пласціны серабра, скопішчы выцягнутых і выгнутых крышталёў, дэндрытаў у Нарвегіі, Чылі. Глыбы самароднай медзі (400 т) знойдзены ў ЗША, 842 кг у Казахстане, канкрэцыя медзі 75 кг у ЗША. С. плаціны (плаціноідаў) параўнальна рэдкія; унікальная знаходка (да 8,4 кг) на Урале (Расія).

САМА́РСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на ПдУ еўрап. ч. Расійскай Федэрацыі, у сярэднім цячэнні р. Волга. Утворана 14.5.1928 як Сярэдняволжская вобл., з 1929 Сярэдняволжскі край, з 1935 Куйбышаўскі край, у 1936 Куйбышаўская вобл., з 1990 сучасная назва. Пл. 53,6 тыс. км^2. Нас. 3295 тыс. чал. (2000), гарадскога 81%. Цэнтр — г. *Самара*. Найб. гарады: *Тальяці*, *Сызрань*, Навакуйбышаўск, Чапаеўск.

Правабярэжная ч. вобласці занята Прыволжскім узв. (выш. да 315 м), якое парэзана ярамі і лагчынамі, і гарамі Жыгулі выш. да 370 м. Левабярэжжа — хвалістая раўніна, на ПнЗ размешчана Нізкае Заволжа, на ПнУ — Высокае Заволжа (Сокскія і Кінельскія Яры), на Пд і ПдУ Каменны і Сярэдні Сырт. Карысныя выкапні: нафта і прыродны газ (*Волга-Уральскі нафтагазаносны басейн*), гаручыя сланцы, сера, гіпс, вапнякі, бітум, фасфарыты. Клімат кантынентальны, засушлівы. Сярэдняя т-ра студз. -13 °С, ліп. 21 °С. Ападкаў каля 400 мм за год. Гал. р. Волга (340 км на тэр. вобласці) утварае вял. выгін — *Самарскую Луку*. Прытокі Волгі: Уса, Сызрань (справа), Вял. Чарамшан, Сок, Самара, Чапаеўка, Чагра, Вял. Іргіз (злева). Куйбышаўскае і Саратаўскае вадасх. Вобласць размешчана ў лесастэпавай і стэпавай зонах. Глебы пераважна чарназёмныя (вышчалачаныя, сярэднягумусавыя і тлустыя), на правабярэжжы шэрыя і цёмна-шэрыя, на Пд цёмна-каштанавыя, месцамі саланцы. Лясы займаюць каля 12% (пераважна на правабярэжжы і ў Жыгулях). Пашыраны шыракалістыя лясы (дуб, ліпа, клён). Нац. парк Самарская Лука, Жыгулёўскі запаведнік.



Гал. галіна прам-сці — машынабудаванне і металаапрацоўка (58,9% па кошце прадукцыі, 1999). Вытв-сць лег-кавых аўтамабіляў, самалётаў, касм. тэхнікі, с.-г. машын, авіярухавікоў, абсталявання для аэрадромаў, нафтаздабычы, аўтарамонту, энергетыкі; станкоў, матораў, тэлевізараў, суднарамонту. Паліўна-энергет. комплекс (13,5%) прадстаўлены здабычай нафты (7,8 млн. т разам з газавым кандэнсатам, 1999), прыроднага газу, вытв-сцю электраэнергіі (25,5 млрд кВт · гадз). Волжская ГЭС, Самарская ДРЭС. Развіта нафтаперапрацоўчая, нафтахім. і хім. (вытв-сць сінт. спірту і смол, фенолу, аміяку, мін. угнаенняў, палімернай плёнкі), буд. матэрыялаў (вытв-сць цэменту, азбацэментных труб, шыферу), харч. (мукамольная, мясная, малочная, алейная), дрэваапр., у т.л. мэблевая, лёгкая (швейная, трыкат., абутковая) прам-сць. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на вырошчванні збожжавых, мяса-малочнай і мяса-воўнавай жывёлагадоўлі. Пасяўныя пл. займаюць 2,2 млн. га, у т.л. збожжавыя 65%. Вырошчваюць пшаніцу, жыта, ячмень, проса, грэчку, авёс, з тэхн. — сланечнік, кармавыя культуры. Бульба- і агароднінаводства. Садоўніцтва. Вял. масівы арашальных зямель. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак, коз, коней. Птушкагадоўля. Рыбалоўства. Даўж. чыгунак 1388 км, гал. Масква—Сызрань—Самара—Уфа—Чэлябінск. Чыг. вузлы: Самара, Акцябрск, Кінель, Сызрань. Аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 7 тыс. км. Суднаходства па р. Волга. Рачныя парты: Таль-

яці, Жыгулёўск, Самара, Акцябрск, Сызрань. Развіты трубаправодны транспарт. Тэр. вобласці перасякае нафтаправод «Дружба». Курорт — Сергіеўскія Мінер. Воды.

САМА́РСКАЯ ЛУКА́, дугападобная лукавіна р. Волга на ўчастку Тальяці—Самара—Сызрань; утвараецца ў выніку адхілення цячэння Волгі гарамі *Жыгулі*. Таксама ўчастак тэр. ўсярэдзіне гэтай лукавіны. У раёне С.Л. — Волжская ГЭС. Нац. парк Самарская Лука.

САМА́РСКІ Аляксандр Андрэевіч (н. 19.2.1919, с. Новаіванаўскае Амвросіеўскага р-на Данецкай вобл., Украіна), расійскі матэматык, адзін з заснавальнікаў тэорыі матэм. мадэліравання і выліч. эксперыменту. Акад. Рас. АН (1976; чл.-кар. 1966). Замежны чл. Нац. АН Беларусі (2000). Герой Сац. Працы

А.А.Самарскі.

(1979). Скончыў Маскоўскі ун-т (1945). З 1953 у Ін-це прыкладной матэматыкі АН СССР, з 1990 у Ін-це матэм. мадэліравання Рас. АН (у 1990—98 дырэктар). Навук. працы па матэм. фізіцы, тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў, тэорыі нелінейных працэсаў, выліч. матэматыцы. Пабудаваў агульныя тэорыі рознасных схем, ітэрацыйных метадаў рашэння сетачных ураўненняў. Распрацаваў новыя прынцыпы апраксімацыі шматмерных задач, аналітычныя і лікавыя метады рашэння актуальных задач ядз. фізікі, фізікі плазмы, цеплаправоднасці і інш. Правёў разлік атамнага выбуху і дынамікі выбуху тэрмаядз. зараду. Сааўтар адкрыцця эфекту Т-слоя ў плазме, адзін са стваральнікаў тэорыі рэжымаў з абвастрэннем у нелінейных суцэльных асяроддзях. Дзярж. прэмія СССР 1954. Ленінская прэмія 1962.

Тв.: Математическое моделирование: Идеи. Методы. Примеры. М., 1997 (разам з А.П.Міхайлавым); Разностные схемы с операторными множителями. Мн., 1998 (разам з П.М.Вабішчэвічам, П.П.Матусам); Уравнения математической физики. 6 изд. М., 1999 (разам з А.М.Ціхановым); Численные методы математической физики. М., 2000 (разам з А.У.Гулiным).

Літ.: А.А.Самарский: (К 80-летию со дня рождения) // Дифференц. уравнения. 1999. Т. 35, № 2. *М.М.Касцюковіч.*

САМАРУ́Х, унутрана неабходнае самаадвольнае змяненне *сістэмы* ў выніку супярэчнасцей, апасродкаваных знешнімі ўмовамі і ўплывамі. Уласцівы аб'ектам усіх узроўняў пабудовы — ад мех., квантава-фіз. (змены ў субатамных, атамных і малекулярных сістэмах у выніку няўстойлівасці іх структур) і хім. (працэсы С. ў каталітычных сістэмах) да біял. і сац. ўзроўняў. На хім., біял. і сац. узроўнях С. выяўляецца ў адкрытых і цэласных сістэмах (арганізм, грамадства, біясфера); для іх характэрны вышэйшы тып С., якому ўласцівы пераход на больш высокую ступень арганізацыі — самаразвіццё. Прынцып С. разглядаўся яшчэ ў стараж.-грэч. філасофіі (Арыстоцель, Геракліт). Ідэю С. развіваў Г.Лейбніц, які выявіў дзейны пачатак у цялеснай субстанцыі. Вучэнне пра С. матэрыі прапанавалі франц. матэрыялісты (К.Гельвецый, П.Гольбах, Д.Дзідро). І.Ньютан і шэраг філосафаў-метафізікаў 18 ст. адмаўлялі магчымасць С. і сцвярджалі, што кожны рух мае знешнюю крыніцу (абсалютны першапачатак, Бог). Разгорнутую канцэпцыю С. і яго модусаў распрацаваў Г.Гегель, які разглядаў С. як формы самавыяўлення абсалютнай ідэі. Гл. таксама *Рух, Развіццё, Самаарганізацыя, Сінергетыка.*

Літ.: Свидерский В.И. Противоречивость движения и ее проявления. Л., 1959; Морозов В.Д. Проблема развития в философии и естествознании. Мн., 1969; Солопов Е.Ф. Движение и развитие. Л., 1974; Самоорганизация: кооперативные процессы в природе и обществе. Ч. 1—2. М., 1990; Концепция самоорганизации в исторической ретроспективе. М., 1994. *М.В.Таратквевіч.*

САМА́РЫЙ (лац. Samarium), Sm, хімічны элемент III групы перыяд. сістэмы, ат. н. 62, ат. м. 150,36; адносіцца да *лантаноідаў*. Прыродны складаецца з 6 стабільных ізатопаў з масавымі лікамі 144, 148—150, 152, 154 і радыеактыўнага ^{147}Sm (перыяд паўраспаду $1{,}3\cdot10^{11}$ гадоў). У зямной кары $7\cdot10^{-4}$% па масе. Адкрыты франц. хімікам П.Э.Лекокам дэ Буабадранам у 1879; вылучаны ў выглядзе аксіду з мінералу самарскіту (адсюль назва).

Серабрыста-жоўты метал, $t_{пл}$ 1072 °С; ніжэй за 917 °С існуе α-Sm (шчыльн. 7536 кг/м^3), вышэй — β-Sm (шчыльн. 7400 кг/м^3). У паветры ўстойлівы, пры пакаёвай т-ры ўзаемадзейнічае з вадой, галагенамі, мінер. к-тамі. Ступень акіслення ў злучэннях пераважна +3; злучэнні Sm(II) — моцныя аднаўляльнікі. Асн. метад атрымання метал. С. — металатэрмічнае аднаўленне сесквіаксіду Sm_2O_3 лантанам ці мішметалам. Выкарыстоўваюць як кампанент магн. сплаваў з кобальтам (гл. *Магнітацвёрдыя матэрыялы*), пракат (стужка) як электроды для стартэраў лямпаў дзённага асвятлення, а таксама ў вытв-сці люмінафораў, спец. шкла, каталізатараў, пігментаў і інш.

САМА́РЫН Іван Васілевіч (19.1.1817, С.-Пецярбург — 25.8.1885), рускі акцёр і педагог. Вучань і паслядоўнік М.*Шчэпкіна*. Скончыў Маскоўскае тэатр. вучылішча (1837), з 1862 выкладаў у ім. З 1837 у трупе Малога т-ра. Пачынаў з амплуа «першага палюбоўніка», з канца 1850-х г. перайшоў ад гераіка-рамантычнага рэпертуару да характарных роляў. Найб. значныя ролі: Чацкі (1839), Фамусаў (1864; «Гора ад розуму» А.Грыбаедава), Гамлет («Гамлет» У.Шэкспіра, 1857; С. — рэжысёр). З інш. роляў: Петручыо, Бенядзікт («Утаймаванне свавольніцы» і «Многа шуму з нічога» Шэкспіра), Мурамскі («Вяселле Крачынскага» А.Сухаво-Кабыліна). З 1874 кіраваў драм. класам Маскоўскай кансерваторыі. Са студэнтамі опернага класа кансерваторыі ажыццявіў на сцэне Малога т-ра першую пастаноўку оперы «Яўген Анегін» П.Чайкоўскага (1879). Аўтар п'ес, якія ставіліся ў правінцыі.

Літ.: Рогачевский М. И.В.Самарин. М.; Л., 1948.

САМА́РЫН Юрый Фёдаравіч (3.5.1819, С.-Пецярбург — 31.3.1876), рускі эканаміст, грамадскі дзеяч, філосаф, гісторык і публіцыст. Скончыў Маскоўскі ун-т (1838). У 1844—52 на дзярж. службе, з 1853 займаўся літ.-публіцыст. дзейнасцю. Удзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні сял. рэформы 1861 (эканамічна абгрунтаваў яе ў кн. «Аб прыгонным стане і пераходзе з яго да грамадзянскай свабоды», 1856). Як філосаф — напачатку прыхільнік Гегеля. У пач. 1840-х г. далучыўся да *славянафілаў*. Распрацаваў тэорыю аб трох перыядах нац. жыцця: «надзвычайнай нацыянальнасці», «пераймальнасці» і «разумнай народнасці». Лічыў, што толькі ў народзе захоўваецца «дух у яго жывой цэльнасці», матэрыялізм «зусім не вынікае з прыродазнаўчых навук». Яго паліт. дактрына грунтавалася на прызнанні толькі дзвюх узаемазвязаных сіл — самадзяржаўя і вясковай абшчыны. Навук. працы па сац.-эканам. і нац. адносінах у Прыбалтыцы, скасаванні прыгоннага права ў Прусіі, гісторыі езуітства. Аўтар літ.-эстэт. артыкулаў аб творчасці М.Ю.Лермантава і М.В.Гогаля.

Тв.: Соч. Т. 1—10, 12. М., 1877—1911.

САМАРЫ́НДА (Samarinda), горад у Інданезіі, на У в-ва Калімантан. Адм. ц. прав. Усходні Калімантан. Каля 350 тыс. ж. (2000). Марскі порт у нізоўях р. Махакам. Вузел аўтадарог. Цэнтр раёна здабычы вугалю і нафты. Вываз вугалю, нафты, драўніны, каўчуку. Дрэваапр. прадпрыемствы. Суднаверф. Ун-т.

САМАРЫЦЯ́НЕ, этнічная група і рэліг. абшчына (каля 400 чал.). Жывуць у гарадах Наблус (Іарданія) і Халон (Ізраіль). С. — патомкі вавілонскіх каланістаў, пераселеных у 722 да н.э. ў *Самарыю*, якія змяшаліся з насельніцтвам *Ізраільскага царства*. З Бібліі прызнаюць толькі Пяцікніжжа ў асобай рэдакцыі. Лічаць свяшчэннай гару Герызім (каля г. Наблус). З канца 6 ст. да н.э. з-за абвастрэння рэліг.-паліт. супярэчнасцей адышлі ад іудзейскай абшчыны ў Іерусаліме. У 129 да н.э. хасманейскі правіцель Гіркан I (гл. *Макавеі*) разбурыў храм на гары Герызім. У 36 н.э. пры *Понцію Пілаце* рымляне ўчынілі крывавую расправу над С. Жылі таксама ў Егіпце, Сірыі, Рыме, Грэцыі і Іране.

САМА́РЫЯ (стараж.-яўр. Шамро́н; цяпер паселішча Себастыя каля г. Наблус, Іарданія), старажытны горад у Палесціне. Засн. каля 880 да н.э. царом *Ізраільскага царства* Омры, пасля 876 да н.э. сталіца гэтага царства. З 729 да н.э. плаціла даніну Асірыі; у 722—721 да н.э. зруйнавана асірыйцамі, якія выселілі б.ч. насельніцтва і пазней засялілі С. перасяленцамі з розных абласцей асірыйскай дзяржавы. Змяшаўшыся з рэшткамі мясц. насельніцтва, перасяленцы стварылі пазней ядро *самарыцян*. У 6—4 ст. да н.э. С. — адм. цэнтр перс. правінцыі ў Палесціне. У 332 да н.э. завяванa Аляксандрам Македонскім, заселена македанянамі і сірыйцамі і развівалася як эліністычны горад. Каля 107 да н.э. зруйнавана хасманейскім правіцелем Гірканам I (гл. *Макавеі*). У 63 да н.э. ўключана ў рым. правінцыю Сірыя. У 30—20-я г. да н.э. цар Іудзеі *Ірад I*, атрымаўшы С. ад Аўгуста, адбудаваў яе і назваў Себастай. У 1 ст. н.э. С. — адзін з асяродкаў ранняга хрысціянства. Пасля *Іудзейскай вайны 66—73* заселена рым. ветэранамі. У 2—3 ст. перажывала найб. росквіт. У час візант. ўладарання страціла б. значэнне, з 7 ст. звычайнае паселішча.

САМАРЭГУЛЯ́ЦЫЯ ў біялогіі, уласцівасць *біялагічных сістэм* аўтаматычна ўстанаўліваць і падтрымліваць на пэўным, адносна пастаянным, узроўні біял. (фізіял.) паказчыкі. Да сістэм, што самарэгулююцца, адносяцца тыя, у якіх параметры, што рэгулююцца, канстантныя, а вынікі — стэрэатыпныя (напр., стэрэатыпныя, таму «бессэнсоўныя» ў некат. умовах паводзіны насякомага), таксама адаптыўныя сістэмы, што саманастройваюцца, саманавучаюцца і аўтаматычна прыстасоўваюцца да змен навакольнага асяроддзя. Пры С. кіруючыя фактары фарміруюцца ў самой сістэме, а не ўздзейнічаюць на яе звонку. Механізмы С. разнастайныя. Напр., рэгуляцыя паводле прынцыпу адваротнай сувязі на малекулярным узроўні — ферментатыўныя рэакцыі, у якіх канчатковы прадукт уплывае на актыўнасць ферменту; на клетачным узроўні — самазборка клетачных арганел з біял. макрамалекул, на надклетачным — самаарганізацыя разнародных клетак ва ўпарадкаваныя клетачныя асацыяцыі. Большасць органаў здольныя да ўнутрыарганнай С. функцый. Напр., унутрысардэчныя *рэфлекторныя дугі* забяспечваюць заканамерныя суадносіны ціску ў поласцях сэрца. На арганізмавым узроўні С. забяспечвае і падтрымлівае пэўныя паказчыкі ўнутр. асяроддзя (*гамеастаз*): т-ру, крывяны і асматычны ціск, узровень цукру ў крыві. Відавы (*папуляцыя*) і надвідавы (*біяцэноз*) узроўні С. — старэнне і смерць біял. асобін, суадносіны полаў, рэгуляцыя колькасці папуляцый і інш.

Літ.: Общая физиология нервной системы. Л., 1979; Пальцев М.А., Иванов А.А. Межклеточные взаимодействия. М., 1995.

С.С.Ермакова.

САМАСВЯДО́МАСЦЬ, усведамленне чалавекам сваіх дзеянняў, пачуццяў, думак, становішча ў грамадстве; цэласная ацэнка самога сябе як сацыяльнай істоты. Служыць індывіду асновай для самарэгулявання, самаканторолю за сваёй дзейнасцю. Па накіраванасці псіхікі індывіда С. арыентавана на ўнутр. свет, процілеглая ўсведамленню знешняга свету, аднак уключае не толькі ацэнку свайго «Я», але і асэнсаванне адносін свайго «Я» да знешняга свету — прыроды і грамадства. Структура С. ўключае: самапазнанне — пазнанне «Я», яго сутнасці і спецыфікі, здольнасцей і магчымасцей, грамадскіх вынікаў сваіх паводзін і ўчынкаў; самаацэнку — ацэнку асобай самой сябе, сваіх магчымасцей, якасцей і месца сярод інш. людзей; ідэнтыфікацыю — працэс самаатаясамлення індывіда з інш. чалавекам, групай, пэўным узорам і інш. С. не з'яўляецца прыроджанай уласцівасцю чалавека: фарміруецца паступова ў працэсе сацыялізацыі асобы. У працэсе развіцця чалавек спачатку ўсведамляе знешні свет, С. дасягае на больш высокім узроўні развіцця. С. — грамадска абумоўленая з'ява: фарміруецца з дапамогай ацэначных адносін, якія складваюцца ў працэсе зносін людзей, сістэмы патрабаванняў, якія прад'яўляюцца грамадствам да асобнага чалавека. С. уласціва не толькі індывіду, але і грамадству, сац. групе, нацыі, якія дасягнулі ўзроўню асэнсавання свайго становішча ў сістэме грамадскіх адносін, агульных ідэалаў, мэтаў і шляхоў іх дасягнення. Гл. таксама *Свядомасць*.

Літ.: Спиркин А.Г. Сознание и самосознание. М., 1972; Гарнцев М.А. Проблема самосознания в западноевропейской философии (от Аристотеля до Декарта). М., 1987; Франкл В. Человек в поисках смысла: Пер. с англ. М., 1990; Фромм Э. Душа человека: Пер. с нем. М., 1992; Мамардашвили М. Необходимость себя: Введение в философию, докл., статьи, филос. заметки. М., 1996; Самосознание культуры и искусства XX в.: Западная Европа и США. М.; СПб., 2000.

Т.І.Адула.

САМАСТО́ЙНЫ БАЛА́НС, закончаны баланс, бухгалтарскі *баланс*, які складае прадпрыемства, арганізацыя, інш. гасп. органы. Асобныя падраздзяленні прадпрыемства складаюць свой — незакончаны баланс (састаўная частка С.б.).

САМАСТРЭ́Л, механічны лук з моцнай дугой і прыстасаваннем для нацягвання цецівы. Былі ручныя і станковыя. У Кіеўскай Русі вядомы з 10 ст., у Зах. Еўропе — з канца 11 ст. (гл. *Арбалет*).

САМАСТРЭ́ЛЬНІКІ, геалагічнае агаленне стараж. азёрна-балотных адкладаў; палеанталагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1963); з 1998 у складзе геолага-геамарфалагічнага помніка прыроды *рова Яна і Цэцылії*. Размешчаны ў рове на левабярэжжы р. Нёман, каля в. Багатырэвічы (б. Самастрэльнікі) Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл. У борце рова (выш. да 13 м) на працягу 50 м агаляюцца адклады муравінскага міжледавікоўя (магутнасць 3,3 м), багатыя на рэшткі рэліктавых раслін (больш за 100 відаў) выкапнёвай флоры ляснога тыпу, што існавала каля 100 тыс. г. назад. У агаленні выяўлены новыя для адкладаў муравінскага міжледавікоўя віды раслін.

В.Ф.Вінакураў.

САМАСУ́Д Самуіл Абрамавіч (14.5.1884, Тбілісі — 6.11.1964), расійскі дырыжор. Нар. арт. СССР (1937). Скончыў Тыфліскае муз. вучылішча (1906), вучыўся ў Празе і Парыжы. З 1910 дырыжор опернага т-ра пецярбургскага Нар. дома. У 1917—19 у Марыінскім т-ры, з 1918 гал. дырыжор і маст. кіраўнік Ленінградскага Малога опернага т-ра, з 1936 гал. дырыжор Вял. т-ра, у 1943—50 — Муз. т-ра імя К.Станіслаўскага і У.Неміровіча-Данчанкі. З 1953 узначальваў сімф. аркестр Маскоўскай філармоніі; з 1957 арганізатар і маст. кіраўнік оперна-сімф. аркестра Усесаюзнага радыё і тэлебачання. З яго дзейнасцю звязана станаўленне сав. опернага мастацтва. Сярод твораў, пастаўленых пад яго кіраўніцтвам, оперы «Нос» (1930) і «Лэдзі Макбет Мцэнскага павета» (1934) Дз.Шастаковіча, «Іван Сусанін» М.Глінкі (1939) і інш.; 7-я сімф. Шастаковіча (1942) і 7-я сімфонія С.Пракоф'ева (1952) і інш. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1947, 1952.

САМАТАТРО́ПНЫ ГАРМО́Н, тое, што *гармон росту*.

САМАТЛО́РСКАЕ РАДО́ВІШЧА нафтавае. У Цюменскай вобл., Расія. Уваходзіць у *Заходне-Сібірскую нафтагазаносную правінцыю*. Адкрыта ў 1965, эксплуатуецца з 1969. Паклады ў тэрыгенных адкладах ніжняга мелу і верхняй юры на глыб. 1610—2350 м. Выяўлена 10 пакладаў нафты нафтэнаметанавага тыпу, у т.л. з газавай шапкай. Пач. дэбіт свідравін 47—200 т/сут. Шчыльн. нафты 0,85 г/см^3, мае 0,68—0,86% серы. Цэнтр здабычы — г. Ніжнявартаўск.

САМАТУ́ЖНАЯ ВЫТВО́РЧАСЦЬ, дробная хатняя таварная вытворчасць прамысл. прадукцыі, заснаваная на невысокай тэхн. аснове. Гл. ў арт. *Рамяство*.

САМАТЫ́ЧНАЯ НЕРВО́ВАЯ СІСТЭ́МА, частка нервовай сістэмы, якая мае адчувальныя і рухальныя валокны, што інервуюць апорна-рухальны апарат і скуру. Падзел нерв. сістэмы на саматычную і вісцэральную (унутр. органаў), уведзены англ. фізіёлагам У.Х.Гаскелам, умоўны. Гл. таксама *Вегетатыўная нервовая сістэма*.

САМАТЫ́ЧНЫЯ МУТА́ЦЫІ, змены генет. матэрыялу ў клетках цела. Абумоўліваюць *мазаіцызм*. Праяўляюцца ў арганізме і перадаюцца пры *вегетатыўным размнажэнні* (не перадаюцца патомкам пры *палавым размнажэнні*).

Напр., розны колер вачэй, радзімыя плямы, пухліны ў чалавека, жывёл і раслін.

САМАТЭ́ВІЧЫ, Самацеевічы, б. вёска, цэнтр сельсавета і калгаса (да вер. 1991) у Касцюковіцкім р-не Магілёўскай вобл., на аўтадарозе Касцюковічы—Красная Гара. За 30 км на ПдЗ ад Касцюковіч, 33 км ад чыг. ст. Камунары. Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1585 як сяло Крычаўскай вол. і староства Мсціслаўскага ваяв. ВКЛ. З 1772 у складзе Рас. імперыі. У 1795 сяло Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., 220 ж., 46 двароў. У 1842 пабудавана Троіцкая царква, у 1864 адкрыта нар. вучылішча. З 1867 праводзіліся 2 кірмашы на год. У 1888 мяст. С. (яно ж Дзімітраўск) — уласнасць Дз.С.Галынскага; цэнтр воласці, 744 ж., 97 двароў, валасное праўленне, царква, касцёл, школа, бальніца, вятрак, заезны двор, вінакурны завод, 6 крам, Гайдукоўскае паштовае аддзяленне. З 20.8.1924 цэнтр сельсавета Касцюковіцкага р-на Калінінскай акр., з 20.2.1938 — Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну ў снеж. 1942 ням. фашысты загубілі 283 жыхары і ў 1943 часткова спалілі вёску. Вёска С. — радзіма нар. паэта Беларусі А.*Куляшова*, дзе ў 1984 быў адкрыты літ. музей паэта. У выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС (26.4.1986) жыхары вёскі ў 1991 сселены ў пабудаваны пасёлак у Бялынкавіцкім с/с, які атрымаў назву Новыя Саматэвічы. Новыя С. — цэнтр калгаса. За 7 км на ПдУ ад г. Касцюковічы, 10 км ад чыг. ст. Камунары, 167 км ад Магілёва. 890 ж., 330 двароў (2001). Філіял жыллёва-камунальнага камбіната. Сярэдняя школа, аддз. сувязі.

САМАЎЗГАРА́ННЕ, узнікненне ачага *гарэння* без крыніцы запальвання. Абумоўлена рэзкім нарастаннем скорасці экзатэрмічных працэсаў у выніку саманагравання гаручых цвёрдых матэрыялаў (торф, вугаль, драўнянае пілавінне і інш.). Паводле прыроды працэсу, што выклікае саманаграванне матэрыялу, адрозніваюць С. хім. (гл. *Піраформныя рэчывы*), мікрабіял. і цеплавое. Адбываецца пры пэўных умовах, калі цеплавыдзяленне ў ходзе рэакцыі большае за цеплаадвод у навакольнае асяроддзе. Механізм узнікнення гарэння пры С. падобны на механізм узнікнення цеплавога самазагарання. У адрозненне ад С., якое праяўляецца ў выглядзе тлення ці полымнага гарэння, самазагаранне ўзнікае ў выглядзе аб'ёмнага полымнага гарэння газаў і вадкасцей. Гл. таксама *Узгаранне*.

САМАЎНУШЭ́ННЕ, аўтасугестыя, працэс унушэння, накіраваны на самога сябе, пры якім суб'ект і аб'ект уздзеяння ўнушэння супадаюць. Прыводзіць да павышэння ўзроўню самарэгуляцыі, што дазваляе суб'екту выклікаць у сабе пэўныя адчуванні, успрыняцці, кіраваць працэсамі ўвагі, памяці, эмацыянальнымі і саматычнымі рэакцыямі. Можа быць адвольнае і неадвольнае. Адвольнае С. дасягаецца пры дапамозе вербальных (моўных) самаінструкцый або ўзнаўлення ў думках пэўных сітуацый, адназначна звязаных з патрэбным змяненнем псіхічнага або фіз. стану. Эфектыўнаму адвольнаму С. спрыяюць псіхічная рэлаксацыя, багатая фантазія. Неадвольнае С. характарызуецца некрытычнымі адносінамі суб'екта да ўласных ідэй, канцэпцый, ацэнак, адсутнасцю сумненняў у іх правільнасці і верагоднасці, зніжэннем кантралюючых функцый свядомасці. Вынікам гэтага можа стаць рыгіднасць (адсутнасць гібкасці) псіхічнай дзейнасці. С. можа выкарыстоўвацца як метад самакіравання ў псіхатэрапіі, спорце, педагогіцы.

САМАЎПРА́ЎСТВА, злачынства супраць парадку кіравання. Паводле Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь заключаецца ў самавольным ажыццяўленні асобай свайго сапраўднага або мяркуемага права, якое ўчынена з парушэннем устаноўленага прававым актам парадку і прычыніла шкоду ў буйным памеры, істотную шкоду правам і законным інтарэсам грамадзян, ці дзярж. грамадскім інтарэсам. С. таксама лічыцца адм. правапарушэнне, якое ўяўляе сабой самавольнае ажыццяўленне свайго сапраўднага або мяркуемага права, калі дзеянні парушальніка не пацягнулі пазначаных вышэй вынікаў.

Э.І.Кузьмянкова.

САМАФІНАНСАВА́ННЕ, сістэма гаспадарання, пры якой прадпрыемствы (аб'яднанні) пакрываюць свае бягучыя затраты і затраты на расшыранае ўзнаўленне з уласных крыніц. Ва ўмовах С. тэхн. пераўзбраенне, рэканструкцыя, матэрыяльнае стымуляванне і сац. развіццё ажыццяўляюцца за кошт зароблены сродкаў і банкаўскіх крэдытаў. Пры С. асноўны ацэначны паказчык работы — *прыбытак*. С. прадугледжвае шырокае развіццё касп. самастойнасці і ініцыятывы прадпрыемстваў (аб'яднанняў), стварае ўмовы і стымулы для тэхн. абнаўлення і павышэння эфектыўнасці вытв-сці. С. — фінансаванне бізнесу без выкарыстання пазыковых сродкаў і сродкаў, атрыманых у выніку распаўсюджання выпуску акцый. Для арг-цыі бізнесу неабходна сума першапачатковага капіталу; далейшае яго развіццё можа ажыццяўляцца шляхам рэінвесціравання атрыманага прыбытку.

У.Р.Залатагораў.

САМАХВА́ЛАВІЦКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў 1924—31 у *Мінскай акрузе*. Утвораны 17.7.1924. Цэнтр — в. *Самахвалавічы*. Складаўся з 15 сельсаветаў. 18.1.1931 раён скасаваны, 9 сельсаветаў уключаны ў гар. мяжу Мінска, астатнія перададзены Койданаўскаму, Пухавіцкаму, Смілавіцкаму і Уздзенскаму р-нам.

САМАХВА́ЛАВІЧЫ, пасёлак у Мінскім раёне, каля р. Пціч, на шашы Мінск—Слуцк і аўтадарозе, якая злучае пасёлак з г.п. Негарэлае. За 20 км на Пд ад Мінска. Цэнтр сельсавета і эксперым. базы «Русінавічы». 2513 ж., 939 двароў (2001).

Вядомы з 1582 як сяло, цэнтр маёнтка, у 1791 побач існавала і вёска С. З 1793 у Рас. імперыі, мястэчка Мінскага пав., цэнтр воласці. У 1815 — 203 ж., 22 двары, уніяцкая царква, школа, 2 млыны, сукнавальня, з 1863 Святадухаўская царква. У 1897 — 527 ж., 79 двароў, нар. вучылішча, капліца, 2 яўр. малітоўныя дамы, 4 кузні, 15 крам, карчма; у вёсцы 184 ж., 33 двары. У 1924—31 цэнтр *Самахвалавіцкага раёна*, з 1924 цэнтр сельсавета Мінскага р-на. З 1938 пасёлак.

З 1957 у С. Бел. н.-д. ін-ты агародніцтва, бульбаводства і пладаводства. Сярэдняя школа, Дом культуры, 2 б-кі, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Царква Сашэсця Св. Духа. Брацкія магілы супрацоўнікаў рэўкома, сав. воінаў і мірных жыхароў. Помнік У.С.*Амельянюку*.

САМАХВА́ЛАЎ Іван Васілевіч (11.2.1835, Віцебская губ. — ? 1899), вучоны ў галіне ўнутр. медыцыны. Д-р медыцыны (1872). Скончыў Пецярбургскую медыка-хірург. акадэмію (1859). З 1875 гал. ўрач Дынабургскага ваен. шпіталя. У 1882 заснаваў Дынабургскае т-ва ўрачоў. Навук. працы па даследаванні фосфарнай к-ты ў ежы і выдзяленнях.

САМАХО́ДНАЕ ШАСІ́, спецыяльнай канструкцыі *трактар* для с.-г. работ у агрэгаце з навясным абсталяваннем. Мае адкрытую адна- ці двухбрусаваю раму, дзе размяшчаецца навясное абсталяванне або транспартная платформа; рухавік і сілавая перадача размешчаны спераду ці ззаду (найб. пашыраны). Кіраванне навясным абсталяваннем з дапамогай гідраўлічнай сістэмы.

САМАХО́ДНАЯ АРТЫЛЕРЫ́ЙСКАЯ ЎСТАНО́ЎКА (САУ), самаходная ўстаноўка (СУ), артылерыйская гармата на самаходным танкавым шасі або спец. базе, прызначаная для непасрэднага суправаджэння танкавых і мотастралковых падраздзяленняў у баі. Выконвала задачы артыл. падтрымкі рухомых злучэнняў у барацьбе з танкамі, бронемашынамі, агнявымі сродкамі і інш. САУ з'явіліся ў 1-ю сусв. вайну, шырока выкарыстоўваліся ў час 2-й сусв. вайны (СССР, Германія, ЗША і інш.). Мелі гармату калібру 76—203 мм. Падзяляліся па масе на лёгкія (да 20 т), сярэднія (да 40 т) і цяжкія (больш за 40 т); паводле тыпу гармат — на пушкі, гаўбіцы, гаўбіцы-пушкі; па бранявой ахове — на закрытага, паўзакрытага і адкрытага тыпу. З 1960-х г. у сувязі з развіццём *самаходнай артылерыі* САУ (акрамя процітанкавых і зенітных установак) не выпускаюцца.

САМАХО́ДНАЯ АРТЫЛЕ́РЫЯ, від *артылерыі*, узброенай гарматамі і ўстаноўкамі на самаходнай цязе. Да С.а. адносяцца *пушкі, гаўбіцы, мінамёты*, пускавыя ўстаноўкі *рэактыўнай артылерыі*, процітанкавыя кіроўныя ракеты (гл. *Процітанкавы ракетны комплекс*), безадкатныя і зенітныя гарматы (гл. *Зеніт-*

ны артылерыйскі комплекс). Паводле канструкцыі адрозніваюць: самаходныя гарматы гусенічныя, колавыя, колава-гусенічныя; браніраваныя поўнасцю або часткова; вежавыя або бязвежавыя. С.а. выконвае тыя ж задачы, што наземная і зенітная артылерыя на буксірнай цязе. Іл. гл. да арт. *Артылерыя, Самаходная артылерыйская ўстаноўка, Мінамёт.*

САМАЦВЕ́ТЫ, тое, што *каштоўныя камяні.*

СА́МБА (скарочаная назва рус. тэрміна «самбо» — самозащита без оружия), від спарт. барацьбы, асновай якога з'яўляюцца найб. эфектыўныя прыёмы з розных нац. відаў барацьбы.

Узнікла у СССР у 1930-я г. З 1966 прызнана міжнар. відам спорту. Чэмпіянаты свету і Еўропы праводзяцца з 1972. Паядынкі адбываюцца на круглым дыване дыяметрам 9 м, у розных узроставых групах і вагавых катэгорыях. Пры барацьбе ў стойцы дазваляюцца падножкі, падсечкі, абвівы, кідкі праз грудзі і праз спіну, захопы ног рукамі; пры барацьбе лежачы — утрыманні саперніка на спіне і болевыя прыёмы на суставы рук і ног. Паядынак працягваецца 6—8 мін без перапынку. Перамога даецца за кідок саперніка на спіну ці за перавод яго на болевы прыём. Найб. развіта С. ў Балгарыі, Беларусі, Вялікабрытаніі, ЗША, Іране, Іспаніі, Расіі, Японіі і інш.

На Беларусі развіваецца з 1936—37. Першы чэмпіянат Беларусі адбыўся ў 1949, асабіста-камандныя пяршынствы праводзяцца з 1952. Бел. федэрацыя барацьбы С. існуе з 1968. У 1975 і 1992 у Мінску адбыліся чэмпіянаты свету па С., у 1995 — чэмпіянат Еўропы. Зборная каманда Беларусі — сярэбраны прызёр чэмпіянатаў свету (1994), Еўропы (1994, 2000). Сярод бел. спартсменаў найб. вызначыліся чэмпіёны свету і Еўропы Н.*Багіраў*, Я.Далінін (1992, 1995), В.Данілаў (1992, 1993, 1994), І.Казанцава (1992, 1993), В.Казлоўская (1991, 1993, 1994, 1995, 1996, 2000), Т.Масквіна (1994, 1995, 2000), С.Селіханава (1992, 1993, 1995, 1996), К.Сямёнаў (2000), М.Цыпандзін (1992, 1994), В.Юркевіч (1996).

Побач са спарт. С. існуе яго баявы раздзел — самаабарона ад нападу няўзброенага і ўзброенага працiўніка і дзеянні ў адказ (прыёмы абяззбройвання, затрымання, суправаджэння і інш.), які ўваходзіць у сістэму баявой падрыхтоўкі ў арміі і спец. баявых фарміраваннях. *А.М.Петрыкаў.*

СА́МБА (партуг. samba), лацінаамерыканскі (браз.) парны танец афр. паходжання. Тэмп хуткі, муз. памер 2-дольны. Існуе шмат мясц. разнавіднасцей С. Вядомы таксама як бальны танец.

САМБА́Р, горад у Львоўскай вобл. на Украіне, на р. Днестр. Вядомы з 1238. Каля 50 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і шашэйных дарог. Машынабудаванне; з-ды: радыёдэталей, прыладабуд., шкляны і інш.; мэблевы к-т, харч. прадпрыемствы. Арх. помнікі: парафіяльны касцёл (1530—65, перабудаваны ў 17—20 ст.), пабудаваны на месцы ранейшага (1370—1498), касцёл (1709—51) і калегіум (1756—59) езуітаў, ратуша (1638—68, 1844).

САМБУ́К Іван Елісеевіч (28.7.1919, в. Рог Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. — 27.5.1979), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Томскае артыл. вучылішча (1945), Ваенна-інж. радыётэхн. акадэмію ППА імя Говарава (1956). У Чырв. Арміі з 1939. У Вял. Айч. вайну з жн. 1941 на Паўд., Бранскім, Цэнтр., 1-м Укр. франтах. Агнявы ўзвод артыл. палка на чале са старшым сяржантам С. вызначыўся ў ліп. 1943 у баях на Арлоўска-Курскім напрамку, дзе 3 дні адбіваў контратакі варожых танкаў і пяхоты, у час фарсіравання Дзясны, Дняпра і Прыпяці агнём гармат садзейнічаў пераправе і наступленню палка. Да 1960 у Сав. Арміі, потым на выкладчыцкай рабоце. Гаўбіца, разлікам якой камандаваў С., экспануецца ў Бел. дзярж. музеі гісторыі Вял. Айч. вайны.

СА́МБУК Сусанна Міхайлаўна (н. 13.12.1924, С.-Пецярбург), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1980). Скончыла Ленінградскі ун-т (1949). З 1953 працавала ў Ленінградскім дзярж. музеі Кастр. рэвалюцыі. У 1957—83 у Ін-це гісторыі АН БССР. Даследуе гісторыю Беларусі 19 — пач. 20 ст.: праблемы с.-д. і рабочага руху, палітыкі царызму, грамадска-паліт. думкі, народніцтва і нац. руху. Адзін з аўтараў 2-томнай «Гісторыі БССР» (т. 1, 1961), 5-томнай «Гісторыі Беларускай ССР» (т. 2, 1972), «Гісторыі Мінска» (1967).

Тв.: Революционные народники Белоруссии (70-е — начало 80-х гг. XIX в.). Мн., 1972; Общественно-политическая мысль Белоруссии во второй половине XIX в. Мн., 1976; Исторические корни дружбы и единения украинского и белорусского народов. Киев, 1978 (у сааўт.); Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. Мн., 1980.

СА́МЕРСАЎ Вілор Фрыдманавіч (24.7.1937, с. Андома Выцегарскага р-на Валагодскай вобл., Расія — 19.4.1999),

І.Е.**Самбук**.

В.Ф.**Самерсаў**.

бел. вучоны ў галіне сельскай гаспадаркі. Акад. Акадэміі агр. навук Беларусі (1992). Чл.-кар. УАСГНІЛ (1988). Д-р с.-г. н. (1984), праф. (1985). Засл. дз. нав. Беларусі (1997). Скончыў Ленінградскі с.-г. ін-т (1960). З 1960 на Слаўгарадскай селекцыйнай станцыі, з 1961 ва Усесаюзным ін-це аховы раслін, з 1963 у аддзеле заалогіі АН Беларусі, з 1971 у Бел. НДІ аховы раслін (заг. аддзела, з 1974 нам. дырэктара, з 1978 дырэктар). З 1992 акад.-сакратар Акадэміі агр. навук Беларусі. Навук. працы па ўплыве мінер. угнаенняў на насякомых, комплекснай сістэме аховы с.-г. раслін ад шкоднікаў, выкарыстанні камп'ютэрнай тэхнікі, развіцці экалагічнага кірунку, каардынацыі міжнар. дзейнасці ў пытаннях аховы раслін.

Тв.: Влияние минеральных удобрений на насекомых. Мн., 1976 (разам з С.Л.Гаравой); Вредители и болезни зерновых культур и меры борьбы с ними. Мн., 1978 (разам з С.Ф.Буга); Интегрированная система защиты зерновых культур от вредителей. Мн., 1988.

САМІ́ЙЛЕНКА Уладзімір Іванавіч (3.2.1864, с. Вялікія Сарочынцы Міргарадскага р-на Палтаўскай вобл., Украі-

1



2

Да арт. **Самаходная артылерыйская ўстаноўка**: 1 — савецкая ІСУ-122 (закрытага тыпу); 2 — нямецкая 88-мм «фердынанд» (закрытага тыпу).

на — 12.8.1925), украінскі паэт. Скончыў Кіеўскі ун-т (1890). Друкаваўся з 1886. Аўтар лірычных, патрыятычных і сатыр. вершаў. Зб-кі «З вершаў Уладзіміра Самійленкі» (1890), «Украіне» (1906). Пераклаў на ўкр. мову асобныя творы Дж.Байрана, П.Бамаршэ, П.Беранжэ, Гамера, Дантэ, А.Франса.

Тв.: Твори. Т. 1—2. Київ, 1958.

Літ.: Бабишкін О. Володимир Самійленко. Київ, 1963.

САМІТ (англ. summit літар. — вяршыня), англамоўнае вызначэнне двух- або шматбаковай сустрэчы ў вярхах (кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў), пашыранае з канца 1980-х г. у бел., рус. і інш. мовах краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

САМІТ ТЫСЯЧАГО́ДДЗЯЎ, сустрэча лідэраў краін (кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў), якія з'яўляюцца членамі *Арганізацыі Аб'яднаных Нацый*. Адбыўся 6—8.9.2000 у г. Нью-Йорк (Рэспубліку Беларусь прадстаўляў Прэзідэнт А.Р.Лукашэнка). Праводзіўся з мэтай узмацнення ролі ААН у міжнар. палітыцы і ў сувязі з пачаткам новага тысячагоддзя. З дакладам на С.т. выступіў Генеральны сакратар ААН К.Анан (кіраўнікі краін і ўрадаў выступалі з 5-хвілінnымі паведамленнямі-дакладамі). На С.т. адзначалася, што ўжо 55 гадоў свет жыве без войнаў паміж вядучымі дзяржавамі, хоць войны, пераважна ўнутры краін, працягваюцца (у 1990-х г. у выніку войнаў і ўзбр. канфліктаў загінула больш за 5 млн. чал.), узмацняецца мілітарызацыя шэрагу дзяржаў і розных слаёў насельніцтва (у арсеналах ядз. дзяржаў знаходзіцца 35 тыс. ядз. боепрыпасаў, а на руках людзей — 500 млн. адзінак стралк. зброі). ААН робіць энергічныя захады для ўмацавання міру (у 1990-я г. падпісана ў 3 разы больш мірных пагадненняў, чым за 3 папярэднія дзесяцігоддзі, вырасла колькасць аперацый ААН у падтрымку міру, міжнар. санкцый, у т.л. фактаў эмбарга на пастаўку зброі ў шэраг дзяржаў). Разам з умацаваннем міру паміж народамі гал. задачамі ААН з'яўляюцца: барацьба з галечай, неадукаванасцю і хваробамі, процідзеянне насіллю і тэрору, барацьба з дэградацыяй і разбурэннем асяроддзя існавання чалавека і інш. У ходзе С.т. адбылося пасяджэнне Савета Бяспекі ААН на вышэйшым узроўні, у якім удзельнічалі У.Пуцін (Расія), Б.Клінтан (ЗША), Т.Блэр (Вялікабрытанія), Ж.Шырак (Францыя), Цзян Цзэмінь (Кітай). Па выніках работы С.т. прынята Заключная дэкларацыя.

Літ.: Саммит тысячелетия в ООН // Междунар. жизнь. 2000. № 10. *Р.Ч.Лянькевіч.*

САМІТЫ (ад грэч. sōma цела), першасныя сегменты цела, парныя метамерныя ўтварэнні, на якія ў працэсе зародкавага развіцця падзяляецца *мезадэрма* (у большасці беспазваночных) або яе дарсальная ч., што прылягае да нерв. трубкі і хорды (у хордавых). Як правіла, С. паступова пашыраюцца ад пярэднага канца цела да заднягa. У хордавых кожны С. пры развіцці падзяляецца на дэрматом, міятом і склератом; з іх утвараюцца адпаведна злучальнатканкавая ч. скуры разам з яе вытворнымі, тулаўная мускулатура і восевы шкілет (у рыб і шкілет плаўнікоў). С. вызначаюць *метамерыю* зачаткаў эктадэрмальнага паходжання або тых, што ўтвараюцца пры ўдзеле *эктадэрмы* (спінальных нерв. вузлоў у пазваночных, канечнасцей у беспазваночных).

САМНАМБУЛІ́ЗМ (ад лац. somnus сон + ambulo хаджу), лунацізм, парушэнне свядомасці і сну, пры якім чалавек несвядома робіць шэраг дзеянняў, не абумоўленых сітуацыяй (напр., ходзіць). Часцей бывае ў дзіцячым і падлеткавым узросце. Пры С. захоўваецца каардынацыя рухаў, назіраецца *амнезія*. С. — выяўленне павышанай эмацыянальнай узбудлівасці, эпілепсіі, істэрыі і інш. хвароб. Лячэнне: ліквідацыя першасных хвароб.

САМНЕР (Sumner) Джэймс Бэтчэлер (19.11.1887, г. Кантан, штат Масачусетс, ЗША — 12.8.1955), амерыканскі біяхімік. Чл. Нац. АН ЗША і Амер. акадэміі мастацтваў і навук. Д-р філасофіі

Дж.**Самнер**.

(1914). Скончыў Гарвардскі ун-т (1910). З 1914 у Корнелскім ун-це (з 1929 праф., з 1947 дырэктар лабараторыі). Навук. працы па прэпаратыўнай хіміі бялкоў і ферментаў. Адкрыў (1926) фермент урэазу, які каталізуе расшчапленне мачавіны, вылучыў яго ў крышт. форме; паказаў бялковую прыроду ферментаў. Нобелеўская прэмія 1946 (разам з *Дж.Х.Нортрапам* і *У.М.Стэнлі*).

САМНІ́ТЫ (лац. Samnites), старажытнаіталійскія плямёны умбра-оскска-сабельскай галіны. Жылі ў гарах, займаліся пераважна жывёлагадоўляй. У 5 ст. да н.э., спусціўшыся з гор, частка С. заняла З і ПдЗ Апенінскага п-ва і змяшалася з мясц. насельніцтвам. У 4 ст. да н.э. ўзначалілі саюз плямён (т. зв. Самніцкая федэрацыя). У 2-й пал. 4 — пач. 3 ст. да н.э. вялі войны з Рымам (гл. *Самніцкія войны*), якія скончыліся падпарадкаваннем С. Падтрымлівалі палкаводцаў *Піра* і *Ганібала* ў час іх паходаў супраць Рыма. Змагаліся супраць Рыма ў *Саюзніцкай вайне 90—88 да н.э.* Амаль поўнасцю знішчаны рым. палкаводцам Л.К.*Сулам* (1 ст. да н.э.).

САМНІ́ЦКІЯ ВО́ЙНЫ, тры вайны паміж Стараж. Рымам і Самніцкай федэрацыяй (саюз *самнітаў* з сабеламі) за панаванне ў Цэнтр. Італіі ў 4—3 ст. да н.э. Паводле рым. падання, у барацьбе Рыма з самнітамі з-за Кампаніі (343—341 да н.э., т. зв. 1-я С.в.) рымляне атрымалі кантроль над Капуяй і Кумамі, самніты — над Тэанумам. Захоп Рымам Неапаля стаў прычынай 2-й С.в. (327—304 да н.э.), якая вялася з пераменным поспехам. Але рымляне, рэарганізаваўшы армію і памяняўшы тактыку баёў, занялі гарады Самнія. Паводле мірнага дагавора самніты аддалі Рыму Кампанію. Замацаванне самнітаў у Луканіі стала прычынай 3-й С.в. (298—290 да н.э.). Ваен. дзеянні праходзілі ў Самніі і Умбрыі, дзе разам з самнітамі супраць Рыма ваявалі *галы* і *этрускі*. Пасля першых няўдач рымляне разбілі самнітаў і галаў пры Сентыне (295 да н.э.). У 290 да н.э. самніты спынілі супраціўленне. Самніцкая федэрацыя была распушчана; самніцкія абшчыны сталі рым. саюзнікамі з абмежаванымі правамі. У выніку С.в. рымляне замацаваліся ў Цэнтр. Італіі.

САМО́А (Samoa), Астравы Мараплаўцаў, група з 14 вулканічных астравоў у Ціхім ак., у Палінезіі, паміж 13—15° паўд. шыраты. Пл. 3 тыс. км². Найбольшыя а-вы: Савайі (1,7 тыс. км²), Уполу (1,1 тыс. км²), Тутуіла (137 км²). У паліт. адносінах падзяляецца на Зах. Самоа (з 1962 — незалежная дзяржава) і Усх. Самоа (уладанне ЗША).

САМО́ЙЛА Уладзімір Іванавіч (29.1.1878, Мінск — 1941), бел. публіцыст, літ. крытык, філосаф. Скончыў Петраградскі ун-т (1916). Удзельнічаў у бел. літ.-грамадскім руху ў Мінску, адзін з заснавальнікаў кніжнага т-ва «Мінчук» (1906). Пры садзейнічанні С. ў газ. «Северо-Западный край» (28.5.1905) надрукаваны на бел. мове верш Я.Купалы «Мужык» — першае выступленне паэта ў друку. У газ. «Минский курьер» (1908) актуалізаваў пытанні асветы нар. мас, неабходнасць бел. школы. Выступаў з арт. пра творчасць Г.Ібсена, А.Блока, Л.Андрэева. З 1918 жыў у Вільні, працаваў выкладчыкам у гімназіях, актыўна супрацоўнічаў у віленскай прэсе. У 1923—27 адзін з вядучых публіцыстаў зах.-бел. перыяд. друку вызв. кірунку. Выступаў па пытаннях грамадска-паліт. жыцця і вызв. руху: філас. эсэ «Гэтым пераможаш!» (1923), «Які «самаўрад» патуе беларускаму народу Польская рэспубліка?» (1924), «Новы» і «найноўшы» курс польскай палітыкі ў беларускай справе» (1932) і інш. У рэцэнзіях і артыкулах пра зах.-бел. л-ру вітаў ідэйныя, маст., жанравыя пошукі пісьменнікаў, разглядаў здабыткі л-ры ў святле росту гіст. і паліт. свядомасці народа. Асн. публікацыі 1930-х г. (пад псеўд. Ул.Чэмер, Ул.С., С.) датычылі помнікаў стараж. л-ры, пытанняў гісторыі бел. мастацтва, музыкі. Для лепшых публікацый С. характэрны шырокі праблем-

ны падыход да з'яў, глыбокая, дасведчаная трактоўка пытання, ярка выражаны публіцыст. стыль.

Тв.: У кн.: Александровіч С.Х., Александровіч В.С. Беларуская літаратура XIX — пачатку XX ст.: Хрэстаматыя крытыч. матэрыялаў. Мн., 1978; У кн.: Беларуская думка XX ст. Варшава, 1998.

Літ.: Александровіч С.Х. Уладзімір Самойла — даследчык паэзіі Янкі Купалы // Песні беларускай валадар. Мн., 1981; Конон В.М. Проблемы искусства и эстетики в общественной мысли Белоруссии начала XX в. Мн., 1985; Калинкович Н. Как дань глубокого уважения... // Нёман. 1979. № 11.

А.С.Ліс.

САМО́ЙЛАВА Таццяна Яўгенаўна (н. 4.5.1934, С.-Пецярбург), расійская актрыса. Дачка Я.В.*Самойлава*. Нар. арт. Расіі (1993). Вучылася ў Тэатр. вучылішчы імя Б.Шчукіна (1953—56), скончыла Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва (1962). У 1958 у Маскоўскім т-ры імя У.Маякоўскага, у 1967—92 у Т-ры-студыі кінаакцёра, з 1994 у Т-ры сучаснай п'есы. Ігра адметная глыбокім драматызмам, тонкім псіхалагізмам. З 1956 здымаецца ў кіно: «Мексіканец» (1956), «Ляцяць жураўлі» (1957, Гал. прыз кінафестывалю ў Канах, 1958), «Неадпраўлены ліст», «Леон Гарас шукае сябра» (СССР—Францыя, абодва 1960), «Альба Рэгія» (Венгрыя, 1961), «Яны ішлі на ўсход» (1964, Італія—СССР), «Ганна Карэніна» (1968), «Доўгая дарога ў кароткі дзень» (1972), «Акіян» (1974), «Брыльянты для дыктатуры пралетарыяту» (1976), «24 гадзіны» (2000) і інш.

САМО́ЙЛАВЫ, сям'я рускіх акцёраў.

Васіль Міхайлавіч (17.4.1782, Масква — 23.7.1839), артыст пецярбургскага Вял. т-ра (1803—39). Выступаў пераважна ў оперы (у тэнаровых і барытонавых партыях); іграў і ў драм. спектаклях. Найб. поспех меў у лірыка-драм. і гераічных партыях у операх К.А.Каваса, Ф.Паэра і інш. Соф'я Васілеўна (народжаная Чэрнікава; 1787—3.3.1854), драм. і оперная артыстка. Жонка Васіля Міхайлавіча. Скончыла тэатр. вучылішча (1804). У 1804 дэбютавала на пецярбургскай сцэне. Выступала ў операх і операх-вадэвілях. Пакінула сцэну ў 1843. Васіль Васілеўч (25.1.1813, С.-Пецярбург — 8.4.1887), драм. акцёр. Сын Васіля Міхайлавіча і Соф'і Васілеўны. Скончыў Горны корпус (1829), Лясны ін-т (1832). Дэбютаваў у 1834 у партыі Іосіфа (опера «Іосіф» Э.Мегюля). У 1835—75 у Александрынскім т-ры. Лепшыя ролі «з пераапрананнем»: Макар Губкін («Студэнт, артыст, харыст і аферыст» Ф.Коні), Стружкін («Акцёр» М.Някрасава) і інш. У п'есах У.Шэкспіра і А.Астроўскага не здолеў узняцца над узроўнем меладраматычнага псіхалагізму і дэкаратыўна падкрэсленай этнаграфічнасці. Вера Васілеўна (1824, С.-Пецярбург — 20.11.1880), драм. актрыса. Дачка Васіля Міхайлавіча і Соф'і Васілеўны. У 1841—53 у Александрынскім т-ры. З артыстызмам, грацыяй, лёгкасцю выконвала лірыка-драм. і камедыйныя ролі: Эльміра («Тарцюф» Мальера). Выдатна валодала мастацтвам вядзення дыялога, тонка перадавала стыль аўтара. І.Тургенеў для яе напісаў камедыі «Дзе тонка, там і рвецца», «Правінцыялка». Надзея Васілеўна (18.1.1818, С.-Пецярбург — 30.3.1899), драм. актрыса. Дачка Васіля Міхайлавіча і Соф'і Васілеўны. У 1838—59 у Александрынскім т-ры. Займала амплуа інжэню ў вадэвілях. Павел Васілевіч (11.7.1866, С.-Пецярбург — 16.4.1931), драм. акцёр.

Т.Я.**Самойлава**.

У.Я.**Самойлаў**.

Я.В.**Самойлаў**.

Засл. арт. Рэспублікі (1923). Сын Васіля Васілевіча. Сцэн. дзейнасць пачаў у Пецярбургу (1888). Іграў у правінцыі, у т.л. ў трупе М.Барадая, у 1891—93 у Т-ры Корша (Масква), у 1904—05 у Драм. т-ры імя В.Камісаржэўскай (Пецярбург), у 1900—04 і 1920—24 у трупе б. Александрынскага т-ра. Напаўняў сваю ігру настроямі трывогі, усведамленнем трагічнай няздольнасці ўвасобіць ідэалы: Гамлет («Гамлет» Шэкспіра), Чацкі («Гора ад розуму» А.Грыбаедава), Старыцын («Прафесар Старыцын» Л.Андрэева), Освальд («Прывіды» Г.Ібсена) і інш.

САМО́ЙЛАЎ Андрэй Рыгоравіч (н. 17.10.1907, с. Ішым Тамбоўскай вобл., Расія), расійскі металург. Чл.-кар. Рас. АН (1976). Скончыў Маскоўскі ін-т каляровых металаў і золата (1935). З 1935 на Маскоўскім камбінаце цвёрдых сплаваў. З 1946 у НДІ неарган. матэрыялаў імя А.А.Бочвара. Навук. працы па металургіі, матэрыялазнаўству, у т.л. тэхналогіі матэрыялаў для ядз. рэактараў. Дзярж. прэміі СССР 1949, 1951, 1953, 1970, 1978. Ленінская прэмія 1964.

Тв.: Дисперсионные твэлы. Т. 1—2. М., 1982 (разам з А.І.Каштанавым, В.С.Волкавым); Тепловыделяющие элементы ядерных реакторов. М., 1985.

САМО́ЙЛАЎ (сапр. Каўфман) Давід Самуілавіч (1.6.1920, Масква — 23.2.1990), рускі паэт. Вучыўся ў Маскоўкім ін-це філасофіі, л-ры і мастацтва (1938—41). Друкаваўся з 1941. Першая кніга паэзіі — «Блізкія краіны» (1958). У паэт. зб-ках «Другі перавал» (1963), «Дні» (1970), «Хваля і камень» (1974), «Вестка» (1978) успаміны і роздум пра вайну, гіст. мінулае Расіі, тэмы мастацтва, кахання. Позняй лірыцы (зб-кі «Заліў», 1981; «Галасы за ўзгоркамі», 1985) уласцівы медытатыўнасць, элегічнасць. Аўтар кн. мемуарных нататак, літ.-крытычных эсэ, літ.-псіхал. партрэтаў «Памятныя запіскі» (апубл. 1995), перакладаў (зб. «Паэты-сучаснікі. Вершы зарубежных паэтаў», 1963), «Кнігі пра рускую рыфму» (1973), пародый і інш. Дзярж. прэмія СССР 1988.

Тв.: Избр. произв. Т. 1—2. М., 1989; В кругу себя. Вильнюс; М., 1993.

Літ.: Баевский В.С. Давид Самойлов: Поэт и его поколение. М., 1986.

САМО́ЙЛАЎ Уладзімір Якаўлевіч (15.3.1924, г. Адэса, Украіна — 8.9.1999), расійскі акцёр. Нар. арт. СССР (1984). Скончыў Адэскае тэатр. вучылішча (1948). На сцэне з 1949. З 1969 у Маскоўскім т-ры імя У.Маякоўскага, з 1994 — у т-ры імя М.Гогаля. Ролі драм. плана: Ермалаеў («Ляцяць пералётныя птушкі» А.Галіна, 1986) і інш. З 1959 здымаўся ў кіно: «Сакратар абкома» (1964), «Дваццаць шэсць бакінскіх камісараў» (1966), «Вяселле ў Малінаўцы» (1968), «Зімародак» (1972), «Прэмія» (1974, Дзярж. прэмія СССР 1976), «Любоў зямная» (1975), «Лёс» (1978), «Сібірыяда» (1979), «Бацькі і дзеці» (1983, Дзярж. прэмія СССР 1986), «Серафім Палубес і іншыя жыхары зямлі» (1984), «Візіт да Мінатаўра» (1987), «Працэс» (1989), «...Па мянушцы «Звер» (1990), «Клан» (1991), «Правінцыяльны бенефіс» (1993), «Бульварны раман» (1994) і інш. Адна з цэнтр. тэм творчасці С. — тэма пазнання героем ісціны праз напружаную барацьбу з самім сабой. Дзярж. прэмія Расіі 1972.

САМО́ЙЛАЎ Яўген Валяр'янавіч (н. 16.4.1912, С.-Пецярбург), расійскі акцёр. Нар. арт. СССР (1974). Скончыў Ленінградскі маст. палітэхнікум (1930), быў у «Трупе акцёрскага майстэрства». У 1934—38 у Т-ры імя У.Меерхольда, у 1940—67 у Маскоўскім т-ры імя У.Маякоўскага, з 1968 у Малым т-ры. Ролі героіка-трагедыйнага плана: Алег Кашавы («Маладая гвардыя» паводле А.Фадзеева), Гамлет («Гамлет» У.Шэкспіра), Шуйскі («Цар Фёдар Іаанавіч» А.К.Талстога). З 1934 здымаецца ў кіно: «Шчорс» (1939, Дзярж. прэмія СССР 1941), «Светлы шлях» (1940), «У шэсць гадзін вечара пасля вайны» (1944, Дзярж. прэмія СССР 1946), «Сэрцы чатырох» (1945), «Адмірал Нахімаў» (1947), «Героі Шыпкі» (1955, СССР—Балгарыя), «Яны змагаліся за Радзіму» (1975) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1947.

Літ.: Актер и время. Вып. 4. М., 1969.

САМО́КІШ Мікалай Сямёнавіч (25.10.1860, г. Нежын Чарнігаўскай вобл., Украіна — 18.1.1944), расійскі жывапісец і графік. Засл. дз. маст. Расіі (1937). Правадз. чл. Пецярбургскай АМ (1913). Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1879—85; яе пенсіянер у Парыжы ў 1886—89), выкладаў у ёй з 1912 (у 1913—18 праф., кіраўнік батальнага класа). З 1923 чл. Асацыяцыі мастакоў рэв. Расіі. Развіваў традыцыі рус. батальнага жывапісу 2-й пал. 19 — пач. 20 ст.: «Бой Максіма Крываноса з Іераміяй Вішнявецкім» (1934), «Пераход Чырвонай Арміі праз Сіваш» (1935) і інш. На бел. тэматыку напісаў карціну «Подзвіг салдат Раеўскага пад Салтанаўкай». Працаваў таксама ў галіне аніміалістычнага жанру і кніжнай графікі. Дзярж. прэмія СССР 1941.

Літ.: Ткаченко В.Я. Н.С.Самокиш: Жизнь и творчество, 1860—1944. М., 1964.

САМО́СА (Somoza), сямейства, прадстаўнікі якога шляхам рэпрэсій і выбарчых махінацый утрымлівалі паліт. ўладу ў Нікарагуа ў 1930—70-я г. Самоса Гарсія (Somoza García) Анастасіо (1.2.1896, Сан-Маркас, Нікарагуа — 29.9.1956), заснавальнік паліт. дынастыі С. Скончыў Нац. ўсх. ун-т (г. Гранада, Нікарагуа). Быў міністрам абароны і ВМФ, паслом у Коста-Рыцы, міністрам замежных спраў. З 1932 каманд. Нац. гвардыяй Нікарагуа, генерал. У 1934 паводле яго загаду забіты А.С.*Сандзіна*. У 1936 шляхам фальсіфікацый і насуперак канстытуцыі абраны прэзідэнтам краіны. Прэзідэнт Нікарагуа ў 1937—47 і 1950—56 (у 1947—50 прэзідэнтам краіны быў яго дзядзька В.М.Раман-і-Рэес). Смяротна паранены праціўнікам рэжыму. Самоса Дэбайле (Somoza Debayle) Луіс Анастасіо (18.11.1922, г. Леон, Нікарагуа — 13.4.1967), сын Самоса Гарсіі. Атрымаў адукацыю ў ЗША. Каманд. Нац. гвардыяй Нікарагуа, палкоўнік. У 1956—63 прэзідэнт Нікарагуа. З 1963 пажыццёвы сенатар, фактычны кіраўнік краіны пры марыянетачным прэзідэнце Р.Шык Гуцьерэсе. Самоса Дэбайле (Somoza Debayle) Анастасіо (5.12.1925, г. Леон — 17.9.1980), малодшы сын Самосы Гарсія. Скончыў ваен. акадэмію ў Уэст-Пойнце (ЗША). У 1964 каманд. Нац. гвардыяй Нікарагуа, генерал. Прэзідэнт Нікарагуа ў 1967—72 і 1974—79. Скінуты ў выніку *Нікарагуанскай рэвалюцыі 1979*. Уцёк у Парагвай, дзе загінуў у выніку тэрарыст. акта.

САМО́СА ДЭБА́ЙЛЕ (Somoza Debayle) Анастасіо, прэзідэнт Нікарагуа ў 1967—72 і 1974—79. Гл. ў арт. *Самоса*.

САМСО́Н (стараж.-яўр. Шымшон, магчыма, ад шэмеш — хвоя), у *Бібліі* (Стары запавет) старажытнаяўрэйскі герой-асілак, надзелены звышчалавечай сілай і адвагай; дванаццаты з «суддзяў ізраілевых». Здзейсніў шматлікія подзвігі ў барацьбе з *філістымлянамі* (знішчыў 1000 ворагаў, выкраў вароты г. Газа і інш.), але закахаўся ў філістымлянку *Далілу*, якая выведала, што неадольная сіла С. — у яго валасах. У час сну філістымляне абстрыглі С., асляпілі і закавалі ў ланцугі. Калі валасы ў С. адраслі, ён разбурыў храм, пад абломкамі якога загінулі філістымляне і С. Біблейскія сюжэты, звязаныя з С., шырока ўвасоблены ў мастацтве: гравюра А.*Дзюрэра*, карціны *Рэмбранта*, А. ван *Дэйка*, А.*Мантэньі*, статуя М.І.*Казлоўскага* для фантана ў Пецяргофе, опера К.*Сен-Санса* і інш.

САМСО́Н Андрэй Міхайлавіч (30.10.1932, г. Давыд-Гарадок Брэсцкай вобл. — 18.1.1997), бел. фізік, пачынальнік тэарэт. даследаванняў дынамікі лазернай

А.М.**Самсон**.

У.П. **Самсонаў**.

генерацыі святла ў Беларусі. Д-р фіз.-матэм. н. (1972), праф. (1977). Скончыў БДУ (1955). З 1955 у Ін-це фізікі АН Беларусі (у 1973—96 заг. лабараторыі). Навук. працы па лазернай фізіцы і оптыцы. Распрацаваў тэарэт. метады разліку нестацыянарных рэжымаў лазераў і распаўсюджвання выпрамянення ў нелінейна-аптычных і рассейвальных асяроддзях. Дзярж. прэмія Беларусі 1976.

Тв.: Нестационарная генерация // Методы расчета оптических квантовых генераторов. Мн., 1968. Т. 2; Высокочастотная автомодуляция излучения лазеров и генерация сверхкоротких импульсов // Проблемы современной оптики и спектроскопии. Мн., 1980; Автоколебания в лазерах. Мн., 1990 (разам з Л.А.Катомцавай, Н.А.Лойка). *В.А.Савва.*

САМСО́НАВА Аліса Самуілаўна (н. 2.7.1940, Мінск), бел. вучоны ў галіне мікрабіялогіі і экалогіі. Д-р біял. н. (1995). Скончыла БДУ (1967). З 1968 у Ін-це мікрабіялогіі Нац. АН Беларусі (з 1994 заг. лабараторыі). Навук. працы па пытаннях узаемадзеяння мікраарганізмаў з кампанентамі навакольнага асяроддзя, метабалічных шляхах ператварэння мікраарганізмамі ксенабіётыкаў, выкарыстанні біятэхналогій для ачысткі навакольнага асяроддзя ад таксічных арган. рэчываў.

Тв.: Микробные ценозы торфяных почв и их функционирование. Мн., 1983 (у саўт.); Биотехнология охраны окружающей среды // Биотехнология — сельскому хозяйству. Мн., 1988; Микробиологический метод очистки сточных вод от метанола и формальдегида (у саўт.) // Изв. Бел. инженер. Академии. 1997. № 1 (3).

САМСО́НАЎ Уладзімір Паўлавіч (н. 10.5.1928, в. Ерахтур Касімаўскага р-на Разанскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне аграбіялогіі. Акад. Акадэміі агр. навук Беларусі (1992). Чл.-кар. Рас. акадэміі с.-г. навук (1991), д-р с.-г. н., праф. (1988). Засл. работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1978). Скончыў БСГА (1952). З 1965 нам. міністра сельскай гаспадаркі Беларусі. У 1974—2000 дырэктар Бел. НДІ земляробства і кармоў. Навук. працы па пытаннях экалогіі ў земляробстве, зніжэнні энергазатрат у с.-г. вытв-сці, тэхналогіі адаптацыйнай інтэнсіфікацыі земляробства і раслінаводства, насенняводства збожжавых культур і стварэння прамысл. насенняводства дасканалага індустрыяльна-біял. профілю. Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

Тв.: Экалагічныя праблемы земляробства // Весці АН БССР. Сер. с.-г. навук. 1991. № 4; Зерно Белоруссии // Земледелие. 1991. № 4; Агроэкологические аспекты борьбы с сорной растительностью в адаптивном земледелии // Ахова раслін. 1999. № 5.

САМСУ́Н (Samsun), горад на Пн Турцыі, на ўзбярэжжы Чорнага м. Адм. ц. іля Самсун. Засн. ў 6 ст. да н.э. Каля 350 тыс. ж. (2000). Марскі порт. Вузел аўтадарог. Аэрапорт. Гандл.-трансп. цэнтр раёна тытуняводства. Прам-сць: харч., тытунёвая, хім.; вытв-сць мінер. угнаенняў, медзеплавільны з-д. Рыбалоўства. Ун-т.

«САМСУ́НГ» (Samsung), шматгаліновая карпарацыя Рэспублікі Карэя. Засн. ў 1938. Дзейнічае ў электроннай, харч., тэкстыльнай і інш. галінах прам-сці, у гандлі; ажыццяўляе распрацоўку прыродных рэсурсаў, фінансаванне прамысл. праектаў, інвестыцыйныя аперацыі ў Паўд. Карэі і інш. краінах. Першая ў краіне па аб'ёме продажу. Занята больш за 170 тыс. чалавек.

САМТА́ЎРСКІ МО́ГІЛЬНІК, вялікі (каля 18 га) розначасовы могільнік на паўн. ускраіне стараж. г. Мцхета (Грузія). Назва ад манастыра Самтаўра, каля якога знаходзіцца могільнік. Даследавана больш за 3 тыс. пахаванняў ад сярэдзіны 3-га тыс. да н.э. да 10 ст. н.э. С.м. з'яўляецца могілкамі жыхароў паселішча бронзавага веку г. Мцхета (стараж. сталіца Картлі), які ўзнік на месцы паселішча ў эліністычны час. Найб. багатыя знаходкамі грунтавыя пахаванні эпохі позняй бронзы (2-я пал. 2-га тыс. да н.э.) і ранняга жалеза (9—5 ст. да н.э.): глянцаваная з геам. арнаментам і каляровая глазураваная кераміка, бронзавая і жал. зброя, упрыгожанні з бронзы, косці, сердаліку, агату, бронзавыя статуэткі жывёл і інш. Да 2—1 ст. да н.э. належаць збанавыя пахаванні, да 1—3 ст. н.э. — пахаванні ў каменных, чарапічных, цагляных скрынях і саркафагах. Знойдзены манеты, помнікі эпіграфікі, творы мастацтва, упрыгожанні (залатыя, сярэбраныя, бронзавыя бранзалеты, пярсцёнкі, завушніцы, падвескі, медальёны з каляровымі камянямі, гемы і інш.), сярэбраны і шкляны маст. посуд. Знойдзена шмат шклянога посуду мясц. вытв-сці і рэчаў туалету.

САМУ́ЙЛ (?—6.10.1014), цар [997—1014] Заходне-Балгарскага царства, якое ў 969 вылучылася са складу *Першага Балгарскага царства* і адстойвала сваю незалежнасць пасля захопу Візантыяй Усх. Балгарыі (971). Нанёс шэраг паражэнняў візантыйцам і вызваліў ад іх б.ч. балг. зямель, далучыў да свайго царства Сербію, значныя часткі Фесаліі і Эпіра. У 1014 пры Бяласіцы пацярпеў паражэнне ад візант. імператара *Васілія II* Балгарабойцы. Пераможца асляпіў 15 000 балг. палонных і накіраваў іх да С., які не вытрымаў гэтага відовішча і раптоўна памёр. У балг. гіст. традыцыі С. — узор цара-воіна і барацьбіта за незалежнасць.

САМУЙЛЁНАК Эдуард Людвігавіч (5.8.1907, С.-Пецярбург — 12.2.1939), бел. пісьменнік. Вучыўся ў польскай

Э.Л.Самуйлёнак.

Т.Дз.Самусенка.

А.Ф.Самусёў.

гімназіі (Петраград). Юнацкія гады правёў на радзіме бацькі ў в. Бандзелі Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. Працаваў у газ. «Чырвоная Полаччына», «Літаратура і мастацтва». Дэбютаваў вершамі ў 1928. Аповесць «Тэорыя Каленбрун» (1933) — востраскожэтны твор пра барацьбу польск. працоўных супраць фашызму. Выкрыццю фашызму і яго дэмагагічнай ідэалогіі прысвечаны апавяданні «Сустрэча», «Урачыстая меса», «Герой нацыі». Аўтар зб-каў прозы «Пункт апоры» (1935), «Дачка эскадрона» (1937). Пісаў пра калектывізацыю («Абухам у лоб», «Русалчыны сцежкі», «Насустрач будучыні»), ідэалізавана адлюстраваў побыт калгаснай вёскі (аповесць «Паляўнічае шчасце», 1933). У рамане «Будучыня» (1938) паказаў жыццё груз. народа. Аўтар п'ес «Сяржант Дроб» (інсцэніроўка аповесці «Тэорыя Каленбрун», паст. 1935, БДТ-3), «Пагібель воўка» (апубл. і паст. 1939, БДТ-1 і БДТ-2).

Тв.: Зб. тв. Т. 1—2. Мн., 1952; Апавяданні. Мн., 1967; Будучыня. Мн., 1970; Апавяданні і аповесць. Мн., 1977.

Літ.: Вольскі В.Ф. Эдуард Самуйлёнак. Мн., 1951; Слова пра сябра: Успаміны аб Эдуарду Самуйлёнку. Мн., 1962.

В.П.Жураўлёў.

САМУ́М (араб. гарачы вецер), сухі гарачы вецер пераважна зах. і паўд.-зах. напрамкаў у пустынях Паўн. Афрыкі і Аравійскага п-ва. Звычайна С. — моцны кароткачасовы (ад 20 мін да 2—3 гадз) шквал, іншы раз з навальніцай, часта суправаджаецца *пылавой бурай*, што зацямняе Сонца. Найчасцей бывае вясной і летам.

САМУРА́І (ад яп. самурау — служыць), у Японіі ў шырокім сэнсе — прадстаўнікі прывілеяванай ваен. касты, якая аб'ядноўвала ўладарных князёў і свецкіх феадалаў; у больш вузкім і ўжывальным — ваен. саслоўе. Пачалі фарміравацца як саслоўе ў перыяд *сёгунаў* дому *Мінамота* [1192—1333], асобае значэнне набылі ў час міжусобных войнаў 14—16 ст. Тады ж склалася асобная самурайская культура, у нечым падобная да рыцарскай культуры Зах. Еўропы (гл. *Рыцарства*), у аснове якой кодэкс гонару С. — *бусідо* з культам вернасці свайму гаспадару. У час сёгуната *Такугава* [1603—1867] статус С. (10% насельніцтва Японіі) афармлены юрыдычна. Заканчэнне міжусобных войнаў прывяло да расслаення саслоўя С., многія з якіх ператварыліся ў ронінаў (С. без гаспадара), некат. з іх папоўнілі шэрагі дэкласаваных элементаў, але б.ч. С. заставалася ў гарадах, дзе займаліся рамяством і гандлем. С. паўд.-зах. княстваў (Сацума, Цёсю, Тоса і Хідзен) адыгралі ключавую ролю ў бурж. рэвалюцыі 1867—68 (гл. *Мэйдзі Ісін*). У 1872 саслоўе С. скасавана, але яго традыцыі працяглы час (да паражэння Японіі ў 2-й сусв. вайне) культываваліся ў яп. арміі.

Літ.: Книга самурая: Пер. с яп. СПб., 1998; Сато Х. Самураи: история и легенды...: Пер. с яп. СПб., 1999; Варли П., Моррис А., Моррис Н. Самураи: Пер. с англ. СПб., 1999; Тернбулл С. Самураи: Воен. история: Пер. с англ. СПб., 1999; Самураи: Меч и душа: Пер. с яп. СПб., 2000; Гвоздев С.А. Самураи: Путь меча. Мн., 2001.

САМУСЕ́НКА (дзявочае Пятрэнка) Таццяна Дзмітрыеўна (2.2.1938, в. Астрашыцкі Гарадок Мінскага р-на — 2.1.2000), бел. спартсменка (фехтаванне на рапірах). Засл. майстар спорту СССР (1960). Засл. дз. фіз. культуры Беларусі (1980). Скончыла БПІ (1962). Чэмпіёнка XVII, XIX і XX Алімп. гульняў (1960, Рым; 1968, Мехіка; 1972, г. Мюнхен, Германія) у камандным заліку, сярэбраны прызёр XVIII Алімп. гульняў (1964, Токіо). Чэмпіёнка свету ў асабістым (1966, Масква) і камандным (1963, г. Гданьск, Польшча; 1965, Парыж; 1966, Масква; 1970, Анкара) заліках. Сярэбраны прызёр чэмпіянатаў свету (1959, Будапешт; 1962, Буэнас-Айрэс; 1967, г. Манрэаль, Канада; 1969, Гавана) у камандным заліку. Бронз. прызёр чэмпіянату свету ў асабістым заліку (1959). Чэмпіёнка СССР у камандным заліку (1960, 1962, 1964, 1968, 1970, 1971, 1972), бронз. прызёр у асабістым заліку (1959, 1965, 1966). *А.М.Петрыкаў.*

САМУСЁЎ Андрэй Фёдаравіч (5.10.1908, в. Высокае Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. — 8.5.1965), Герой Сав. Саюза (1943). У Вял. Айч. вайну з 1941 на фронце, мінамётчык. Вызначыўся ў кастр. 1943 у баях на тэр. Лоеўскага р-на, дзе першы з роты фарсіраваў Дняпро, у баі за плацдарм удзельнічаў у адбіцці контратак праціўніка, чым забяспечыў пераправу інш. падраздзяленняў. Пасля вайны старшыня калгаса.

САМУ́ЦІН Васіль Емяльянавіч (28.6.1906, с. Ваўчкоў Перавоз Любомльскага р-на Валынскай вобл., Украіна — 13.8.1981), адзін з кіраўнікоў падполля і партыз. руху на тэр. Беластоцкай вобл. ў Вял. Айч. вайну, журналіст. Засл. дз. культ. Беларусі (1967). Скончыў курсы Вышэйшай парт. школы пры ЦК КПСС (1952). З 1927 на камсам., з 1930 і ў 1939 на журналісцкай рабоце. З 1934 на падп. рабоце ў Зах. Беларусі. У Вял. Айч. вайну з 1941 на фронце, з 1942 рэдактар падп. газ. «Віцебскі рабочы», з 1943 1-ы сакратар Беластоцкага падп. абкома КП(б)Б, кіраўнік Беластоцкага партыз. злучэння. Пасля вайны на парт. і журналісцкай рабоце, у 1950—53 нам. міністра лясной гаспадаркі БССР. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1947—51.

САМУЭ́ЛЬ Софія Пятроўна (н. 20.2.1941, в. Еськавічы Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.), гісторык. Засл. работнік культуры Беларусі (1988). Скончыла БДУ (1966). З 1969 у выд-ве «Беларуская Энцыклапедыя»: заг. рэдакцыі, у 1992—96 нам. гал. рэдактара. Аўтар артыкулаў па гісторыі Беларусі, адзін з рэдактараў і складальнікаў шэрагу энцыклапедычных выданняў, у т.л. гісторыка-дакументальных хронік «Памяць». Дзярж. прэмія Беларусі 1990 за выданне *«Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі»*.

САМУЭЛЬСАН (Samuelsson) Бенгт Інгемар (н. 21.5.1934, г. Хальмстад, Швецыя), шведскі біяхімік. Чл. Шведскай каралеўскай АН, замежны чл. Амер. акадэміі мастацтваў і навук. Скончыў мед. каледж Лундскага ун-та. З 1958 у Каралінскім ін-це (з 1972 праф., з 1982 рэктар), у 1967—72 праф. Стакгольмскага каралеўскага вет. каледжа. Вылучыў і ўстанавіў хім. структуру і біяхім. якасці некат. простагландзінаў і звязаных з імі біялагічна актыўных рэчываў. Паказаў іх утварэнне з арахідонавай к-ты, а таксама, што арахідонавая к-та і ферментатыўныя сістэмы ўтварэння простагландзінаў ёсць ва ўсіх ядз. клетках жывёльных арганізмаў. Нобелеўская прэмія 1982 (разам з С.*Бергстрэмам* і Дж.Р.*Вейнам*). *А.Ю.Маніна.*

САМЦХЕ-САТА́БАГА, княства на тэр. Паўд. Грузіі ў 13—17 ст. У 13 ст. самцхійскія гаспадары (эрыставі) сталі ўла-

дарнымі князямі (мтаварамі) усёй Паўд. Грузіі. З пач. 14 ст. мелі тытул атабага (адсюль назва княства). У С.-С. ўваходзілі Самцхе, Аджара, Шаўшэты, Кларджэты і інш. вобласці Паўд. Грузіі. З пач. 16 ст. ў васальнай залежнасці ад Турцыі, якая ў 1620-я г. скасавала С.-С.

САМЦЭ́ВІЧ Васіль Андрэевіч (19.3.1889, в. Дакудава Крупскага р-на Мінскай вобл. — 11.10.1973), бел. педагог, краязнавец. Брат П.А.*Самцэвіча*, С.А.*Самцэвіча*. Засл. настаўнік Беларусі (1945). Скончыў Віцебскі настаўніцкі ін-т (1915), вучыўся ў Віцебскім аддз. Маскоўскага археал. ін-та. У 1918—28, 1932—56 працаваў у органах нар. асветы Беларусі, настаўнікам; у 1928—32 навук. сакратар Цэнтр. бюро краязнаўства Інбелкульта (з 1929 у складзе АН Беларусі). Аўтар падручнікаў па бел. мове і метадычных дапаможнікаў для пач. школы.

САМЦЭ́ВІЧ Пётр Андрэевіч (6.3.1899, в. Дакудава Крупскага р-на Мінскай вобл. — жн. 1941), бел. лінгвіст і фалькларыст. Брат В.А.*Самцэвіча*, С.А.*Самцэвіча*. Скончыў Горы-Горацкі с.-г. ін-т (1922), вучыўся ў Мінскім пед. ін-це (1937—41). З 1923 настаўнічаў, збіраў матэрыялы па гісторыі, геаграфіі, геалогіі Барысаўшчыны. Друкаваўся ў час. «Наш край». Адзін з арганізатараў Барысаўскага краязнаўчага музея, якому перадаў калекцыю прадметаў археалогіі і этнаграфіі. У 1924 перадаў Інбелкульту больш за 300 тэкстаў замоў, казак, песень, прыпевак (запісаў больш за 1000 фальклорных твораў). Паводле даручэння камісіі Інбелкульта па складанні гіст. слоўніка бел. мовы збіраў і апрацоўваў лінгвістычны матэрыял. Складаў слоўнік тапонімаў і мікратапонімаў Барысаўшчыны і Крупшчыны.

Г.А.Каханоўскі.

САМЦЭ́ВІЧ Сямён Андрэевіч (27.7.1902, в. Дакудава Крупскага р-на Мінскай вобл. — 30.5.1985), бел. вучоны ў галіне

Б.Самуэльсан.

С.А.Самцэвіч.

мікрабіялогіі. Брат В.А.*Самцэвіча* і П.А.*Самцэвіча*. Чл.-кар. АН Беларусі (1967). Д-р біял. н. (1954), праф. (1956). Засл. дз. нав. Беларусі (1977). Скончыў Горы-Горацкі земляробчы ін-т (1924), Валагодскі малочна-гасп. ін-т (1930). У 1934—38 у Ін-це біял. навук АН Беларусі. Потым працаваў на Украіне. З 1964 у Ін-це эксперым. батанікі АН Беларусі (заг. лабараторыі, у 1966—73 заг. аддзела). З 1977 навук. кансультант Ін-та мікрабіялогіі АН Беларусі. Навук. працы па пытаннях узаемадзеяння мікраарганізмаў глебы і вышэйшых раслін, магчымасцях кіравання гэтым працэсам. Вывучыў прыроду сімбіёзу клубеньчыкавых бактэрый і бабовых раслін.

Тв.: Взаимоотношения микроорганизмов почвы и высших растений // Микроорганизмы почвы и растение. Мн., 1972; Фитотоксические свойства почвенных микроорганизмов. Л., 1978 (у сааўт.).

Літ.: С.А.Самцевич: Биобиблиогр. указ. Мн., 1982.

САМШЫ́Т (Buxus), род кветкавых раслін сям. самшытавых. Больш за 50 відаў (паводле інш. звестак да 70). Пашыраны ў Паўд.-Усх. Азіі, Цэнтр. і Паўд. Еўропе, Афрыцы. У Зах. Еўропе ўведзены ў культуру з ант. часу. На Беларусі інтрадукаваны С. вечназялёны (B.sempervirens).

Галінка **самшыта** вечназялёнага.

Вечназялёныя кусты або дрэвы выш. да 20 м. Жывуць да 500 гадоў. Лісце супраціўнае, суцэльнае, скурыстае. Кветкі дробныя, аднаполыя, сабраныя ў галоўчата-коласападобнае пазушнае суквецце. Плод — каробачка. Драўніна С. («пальмавае дрэва») жоўтая, шчыльная, трывалая, ідзе на дробныя вырабы. Дэкар. расліны.

САН, званне, звязанае з ганаровым становішчам, высокай пасадай у службовай іерархіі; званне свяшчэннаслужыцеля.

САН (San), рака на ПдУ Польшчы, правы прыток р. Вісла, у вярхоўях на невял. участку цячэ па мяжы Польшчы з Украінай. Даўж. 444 км, пл. басейна 16,7 тыс. км^2. Вытокі ва Усх. Бяскідах (сістэма Карпат), перасякае Сандамірскую нізіну. Асн. прытокі: Віслак (злева), Танеў (справа). Разводдзе ў лютым—маі, летнія паводкі. Сярэдні расход вады ў ніжнім цячэнні 125 м^3/с. Сплаўная; у вярхоўях Салінскае і Мычкоўскае вадасх., ГЭС. На С. — гарады Санак, Пшэмысль, Ярослаў.

САНА́, горад, сталіца Йемена; на З краіны ў міжгорнай даліне на выш. 2400 м. Больш за 1 млн. ж. з прыгарадамі (2000). Вузел аўтадарог, у т.л. да порта Хадэйда на Чырвоным моры. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: тэкст., металаапр., мэблевая, тытунёвая, кансервавая, цэм.,

Сана. Аздабленне фасада жылога дома.

абутковая. Буйны цэнтр саматужнай вытв-сці залатых, сярэбраных, медных вырабаў, тканін і інш. Ун-т. Горад моцна пацярпеў ад землетрасення 1982.

Вядома з 1 ст. Ролю паліт. цэнтра пачала адыгрываць у 6 ст. У сярэднія вякі праз С. праходзілі гандл. шляхі з Эфіопіі і Індыі ў Міжземнамор'е. З сярэдзіны 7 ст. С. — рэзідэнцыя намеснікаў араб. халіфаў, з сярэдзіны 9 ст. сталіца самаст. дзяржавы Яфурыдаў. У 11—15 ст. у складзе розных дзярж. утварэнняў Паўд. Аравіі. У 1546—1628 пад уладай туркаў. З сярэдзіны 17 ст. рэзідэнцыя зейдзіцкіх імамаў Йемена. У 1871 зноў занята туркамі. У 1911 горад захапіў імам Ях'я, які ў 1918 зрабіў С. сталіцай Йеменскага каралеў-

Сана. Старая частка горада.

ства. У 1962—90 сталіца Іеменскай Арабскай рэспублікі, з 1990 — Ёмена.

Стараж. горад складаецца з 2 частак, якія ў плане ўтвараюць васьмёрку. Ён абнесены сцяной выш. 9 м з паўкруглымі вежамі і шматлікімі брамамі. На стыку 2 гар. тэрыторый — 7-павярховы палацавы комплекс (б. палац імама). У найб. стараж. частцы — Старым горадзе знаходзяцца цытадэль, караван-сарай, медрэсэ, рынкі, сярэдневяковыя лазні, мячэці аль-Джама аль-Кебір, ці Вял. мячэць (7—12 ст.), Бакіліджэ (17 ст.) і інш. Разнастайнасцю вылучаецца жылая забудова: 3—7-павярховыя вежападобныя дамы з каменю і цэглы, пастаўленыя блізка адзін да аднаго. Іх фасады з пабеленымі вапнай фрызамі аздоблены рознымі аркадамі, ажурнымі драўлянымі панэлямі, аконныя праёмы з каляровымі вітражамі. У зах. частцы С. (Садовы горад), пабудаванай у 17—20 ст., пераважаюць асабнякі з садамі, абнесеныя сценамі. Сучасныя будынкі спалучаюць традыц. элементы з новымі тэхналогіямі і буд. матэрыяламі: Цэнтр. банк, Рэсп. палац, Акадэмія паліцыі, Клуб афіцэраў, атэль «Таж Саба», офіс авіякампаніі Эль-Іеманія і інш. Стары горад уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны.*

Халед Сайф Мухамед Табет (архітэктура).

САНА́ГА (Sanaga), рака ў Камеруне. Утвараецца ад сутокаў рэк Джэрэм і Лом, якія пачынаюцца на плато Адамава. Даўж. 918 км (ад вытоку р. Джэрэм), пл. басейна 135 тыс. км^2. Упадае некалькімі рукавамі ў зал. Біяфра. Асн. прыток — Мбам (справа). У сярэднім цячэнні ўтварае парогі і вадаспады. Разводдзе ў чэрв.—снежні. Сярэдні расход вады больш за 2000 м^3/с. Суднаходная ніжэй г. Эдэа, каля якога ГЭС.

САНА́ЕЎ Усевалад Васілевіч (25.2.1912, г. Тула, Расія — 26.1.1996), расійскі акцёр. Нар. арт. СССР (1969). Скончыў



У.В.**Санаеў**.

Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва (1937). З 1937 акцёр Маскоўскага маст. акад. т-ра, з 1943 Т-ра імя Массавета, з 1946 — Т-растудыі кінаакцёра. У 1949—50 выкладаў ва Усесаюзным дзярж. ін-це кінематаграфіі. З 1938 здымаўся ў кіно. Увасобіў на экране галерэю рознахарактарных персанажаў. Мастацтву акцёра ўласцівы вял. жыццёвая верагоднасць, прастата, звычайнасць. Лепшыя ролі ў фільмах: «Любімая дзяўчына» (1940), «У іх ёсць Радзіма» (1949), «Вяртанне Васіля Бортнікава» (1952), «Розныя лёсы» (1956), «У стэпавай цішыні» (1959), «Аптымістычная трагедыя» (1963), «Ваш сын і брат» (1966), «За намі Масква» (1967), «Вяртанне «Святога Лукі» (1970), «Печкі-лавачкі» (1972), «Версія палкоўніка Зорына» (1978), «Тэгеран-43» (1980), «Белыя росы», «Тайна «Чорных драздоў» (абодва 1983), «Забытая мелодыя для флейты» (1987) і інш.

САН-АНТО́НІО (San Antonio), горад на Пд ЗША, у штаце Тэхас. Засн. ў 1718. 1114,1 тыс. ж., з прыгарадамі каля 1,5 млн. ж. (2000). Буйны вузел чыгунак і аўтадарог на шляхах у Мексіку і на зах. ўзбярэжжа. Міжнар. аэрапорт. Гандл.-фін. цэнтр жывёлагадоўчага раёна (буйнейшы ў ЗША рынак шэрсці і махеру). Прам-сць: маш.-буд., металаапр., харч., цэм., хім., швейная, гарбарна-абуткавая. 18 ун-таў і каледжаў. Музеі. Бальнеакліматычны курорт. Арх. помнікі 18—19 ст., у т.л. сабор Сан-Фернанда. Турызм.

САНА́ТА (італьян. sonata ад sonare гучаць), адзін з асноўных жанраў камернай інстр. музыкі. Класічная С. — твор для аднаго або двух выканаўцаў, напісаны ў *санатна-цыклічнай форме*, з асн. часткай цыкла ў *санатнай форме*.

Як вызначэнне інстр. твора вядома з 15 ст. У 17 — пач. 18 ст. сфарміравалася ўстойлівая структура С. як шматчасткавага твора, заснаванага на тэматычных і танальных сувязях паміж часткамі, вобразным і тэмпавым кантрасце ў паслядоўнасці частак. Класічная цыклічная С. сфарміравалася ў 2-й пал. 18 — 1-й пал. 19 ст. ў творчасці І.Гайдна, В.А.Моцарта, М.Клементі. Росквіт жанру, адзначанага складанасцю драматургічнай канцэпцыі і маст. формы, прыпадае на творчасць Л.Бетховена (санатныя цыклы, блізкія да сімфанічных, а таксама цыклы з адвольнай паслядоўнасцю частак і элітныя). У творчасці кампазітараў-рамантыкаў С. набыла вобразнасць, характэрную для іх стылістыкі, рысы паэмнасці (гл. *Паэма* ў музыцы), часам праграмнасць. У канцы 19 — пач. 20 ст. развіццё С. абумоўлена арыентацыяй кампазітараў на класічныя і рамант. традыцыі. Наватарствам і самабытнасцю вылучаюцца С. філас. зместу, з распрацаванай сістэмай сімволікі (А.Скрабін), істотным пераўтварэннем вобразнага ладу муз. мовы, структуры, выканальніцкага складу (Б.Бартак, С.Пракоф'еў, І.Стравінскі, Ф.Пуленк, П.Хіндэміт, Э.Кшэнек і інш.).

У бел. муз. культуры сярод першых твораў санатнага жанру 12 С. для віяланчэлі і фп. Ф.Міладоўскага і С.-фантазія для скрыпкі і фп. М.Ельскага (2-я пал. 19 ст.). Большасць С. бел. кампазітараў напісана ў санатна-цыклічнай форме, на аснове якой узнікла мноства кампазіцыйных варыянтаў (Л.Абеліёвіч, М.Аладаў, А.Багатыроў, А.Сонін, Р.Сурус, Э.Тырманд, К.Цесакоў і інш.), у т.л. і тыя, што ўвасабляюць толькі некаторыя гал. прынцыпы санатнасці (Дз.Смольскі, В.Войцік, А.Мдывані).

Літ.: Гл. да арт. *Санатная форма, Санатна-цыклічная форма.* *Т.А.Дубкова.*

САНА́ТНА-ЦЫКЛІ́ЧНАЯ ФО́РМА, разнавіднасць шматчасткавай цыклічнай *формы музычнай*, характэрная для санатна-сімфанічнага (*сімфоніі, канцэрты* і г.д.) і санатнага (*санаты, трыо, квартэты, квінтэты* і інш.) цыклаў. Ёй уласцівы драматургічная і функцыян. ўзаемасувязь частак на аснове канцэпцыйнага адзінства цыкла пры пэўнай вобразна-тэматычнай іх самастойнасці.

Вытокі С.-ц.ф. ў стараж. цыклічных творах тыпу стараж. санаты, *сюіты*, партыты, *такаты* і інш. У працэсе эвалюцыі выкрышталізаваліся яе структурныя і функцыян. асаблівасці, якія сталі ўстойлівымі (нарматыўнымі) у творчасці венскіх класікаў (2-я пал. 18 — 1-я пал. 19 ст.) І.Гайдна, В.А.Моцарта, Л.Бетховена. Класічная С.-ц.ф. мае 4 часткі (часам 3, як выключэнне — 2). 1-я частка — санатнае алегра (гл. *Санатная форма*), якая зместам і характарам музыкі вызначае маст. сэнс усяго санатна-сімф. цыкла. 2-я частка, павольная, звычайна — лірычны цэнтр санатна-сімф. цыкла. 3-я частка рухомая, з нечаканымі вобразна-тэматычнымі пераключэннямі. Паслядоўнасць сярэдніх частак цыкла бывае адваротная. 4-я частка (фінал) выніковая ў творы. У працэсе развіцця муз. мастацтва адбыліся змены ў канцэпцыях і драматургіі санатна-сімф. цыкла. Наватарскія рысы С.-ц.ф. выявіліся ў інтэрпрэтацыі Бетховена (у 9-й сімф. харавы з салістамі фінал), Г.Берліёза (у «Фантастычнай сімфоніі» ўпершыню выкарыстана лейттэма). З 5-й сімфоніі Бетховена замацоўваецца тэндэнцыя як непасрэднага пераходу адной часткі С.-ц.ф. ў наступную.

У музыцы 20 ст. мадыфікацыі С.-ц.ф. датычаць тэматызму (Дз.Шастаковіч, Р.Шчадрын, Г.Канчэлі, Дз.Смольскі, Я.Глебаў), узаемасувязі частак (І.Стравінскі, А.Веберн, Шастаковіч, С.Пракоф'еў, Я.Цікоцкі, А.Мдывані, Дз.Смольскі, В.Кузняцоў, Ф.Пыталеў і інш.), часам да іх зліцця ў адно цэлае (Канчэлі, Смольскі), колькасці частак і прынцыпаў формаўтварэння (Шастаковіч, А.Месіян, М.Аладаў, Л.Абеліёвіч, Мдывані, К.Цесакоў). У сучаснай музыцы значную ролю адыгрываюць яе індывідуалізаваныя варыянты.

Літ.: Катуар Г.Л. Музыкальная форма. Ч. 2. М., 1936; Способин И.В. Музыкальная форма. 7 изд. М., 1984. *Т.А.Дубкова.*

САНА́ТНАЯ ФО́РМА, нецыклічная *форма музычная*, якой уласцівы процістаўленне дзвюх або некалькіх вобразна-тэматычных сфер, суадносіны якіх грунтуюцца на прынцыпах кантрасту або адрознення, бесперапыннае вобразна-тэматычнае развіццё на аснове прычынна-выніковай сувязі, пэўныя формаўтваральныя танальна-функцыян. суадносіны. Асн. раздзелы С.ф. — *экспазіцыя, распрацоўка, рэпрыза* — утвараюць 3-часткавую кампазіцыю тыпу АВА. Акрамя асн. раздзелаў часам мае уступ і коду (заключны раздзел). С.ф. выкарыстоўваюць у адной з частак, звычайна 1-й (санатнае алегра), санатна-сімф. цыкла (гл. *Санатна-цыклічная форма*). Існуе і як форма самаст. твора (1-часткавыя *санаты, увертюры, фантазіі, паэмы* і інш.). Форма, у якой замест распрацоўкі эпізод, заснаваны на новай тэме, мае назву С.ф. з эпізодам. Магчыма С.ф. без распрацоўкі (характэрная для оперных увертюр, павольных частак санатна-сімф. цыклаў і інш.). Кампазіцыйныя прынцыпы С.ф. выкрышталізаваліся на аснове старадаўніх форм. Класічная С.ф. склалася ў творчасці кампазітараў *венскай класічнай школы*. Пачынаючы з твораў Л.Бетховена, асабліва ў музыцы Р.Шумана, Э.Грыга, Ф.Шапэна, Ф.Ліста, П.Чайкоўскага, А.Скрабіна, С.Рахманінава, С.ф. відазмяняецца ў кампазіцыйных і стылявых параметрах, дынаміцы тэма-

тычнага развіцця, танальных суадносін, формаўтварэння. 20 ст. адзначана фарміраваннем індывідуальных варыянтаў С.ф. (Г.Малер, А.Анегер, Скрабін, С.Пракоф'еў, Дз.Шастаковіч, М.Мяскоўскі, Ю.Юзелюнас, В.Лютаслаўскі, К.Пендарэцкі і інш.). У бел. музыцы С.ф. прадстаўлена шматбакова і ў класічных нормах (Л.Абеліёвіч, М.Аладаў, А.Багатыроў, Г.Вагнер, Я.Глебаў, В.Залатароў, Ф.Пыталеў, К.Цесакоў, Я.Цікоцкі і інш.), і ў разнастайных сучасных мадыфікацыях (У.Дарохін, В.Кузняцоў, А.Мдывані, Дз.Смольскі, А.Сонін, Р.Сурус і інш.).

Літ.: Берков В.О. Сонатная форма и строение сонатно-симфонического цикла. М., 1961; Горюхина Н.А. Эволюция сонатной формы. 2 изд. Киев, 1973; Бобровский В.П. Функциональные основы музыкальнай формы. М., 1978; гл. таксама да арт. *Форма музычная*. *Т.А.Дубкова.*

САНАТО́РЫЙ (новалац. sanatorium ад лац. sano лячу), стацыянарная лячэбна-прафілактычная ўстанова для лячэння з пераважным выкарыстаннем прыродных лек. фактараў (клімат, мінер. воды, лек. гразі і інш.) у спалучэнні з дыетычным харчаваннем, лячэбнай фізкультурай, фізіятэрапеўт. працэдурамі. Падзяляюцца на адна- і шматпрофільныя; для дарослых, дзяцей, падлеткаў, бацькоў з дзецьмі. Профіль С. вызначаецца ў залежнасці ад прыродных фактараў і мед. паказчыкаў. Існуюць С. для хворых на туберкулёз, захворванні органаў дыхання нетуберкулёзнага характару, органаў кровазвароту, стрававання, апорна-рухальнага апарату, нерв. сістэмы, нырак і мачавых шляхоў і інш. У С. могуць быць аддзяленні для асоб, што перанеслі інфаркт міякарда, крывазліцці ў мозг, траўмы касцей і інш. Асн. кірункі дзейнасці С.: лячэбны, рэабілітацыйны (замацаванне вынікаў лячэння), рэкрэацыйны (аздараўленне асоб з сіндромам хранічнай стомленасці, зніжэннем разумовай і фіз. працаздольнасці). На Беларусі 71 С. (2001), дзе ў першую чаргу атрымліваюць мед. дапамогу ліквідатары катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, інваліды, пенсіянеры, хворыя на туберкулёз, хворыя, што перанеслі інфаркт міякарда, аперацыі і г.д. *Э.А.Вальчук.*

САНАТО́РЫЙ-ПРАФІЛАКТО́РЫЙ, лячэбна-прафілактычная ўстанова санаторнага тыпу. Размешчаны звычайна ў горадзе ці прыгарадзе. Падпарадкаваны прамысл. прадпрыемствам і іх прафс. органам. У С.-п. атрымліваюць лячэнне без адрыву ад вытв-сці асобы, якія хварэюць або працуюць ва ўмовах *прафесійнай шкоднасці*, працуючыя інваліды; арганізуюцца таксама С.-п. сямейныя (з дзецьмі), профільныя (з аднароднымі захворваннямі); рэабілітацыя пасля стацыянарнага лячэння (напр., пасля аперацыі). На Беларусі 109 С.-п. (2000). *Э.А.Вальчук.*

САНАЦІ́НА (італьян. sonatina памяншальнае ад sonata), інструментальны твор, блізкі да *санаты*, аднак меншы за яе і тэхнічна больш просты. Характарызуецца прастатой і яснасцю вобразнасці, нескладанай фактурай; яго *санатная форма* мае некат. асаблівасці: *экспазіцыя* лаканічная, распрацоўка невял. або адсутнічае, *рэпрыза* мала дынамізавана. Пашырана пераважна ў пед. рэпертуары (санаціны Ф.Кулаў, М.Клеменці, Л.Бетховена, А.Дворжака, М.Равеля, М.Мяскоўскага, А.Хачатурана, Дз.Кабалеўскага). У бел. музыцы С. для розных інструментаў ёсць у М.Аладава, Г.Вагнера, П.Падкавырава, М.Русіна, А.Туранкова, Э.Тырманд, Л.Шлег, М.Шнейдэрмана і інш. *Ю.Дз.Златкоўскі.*

«САНАЦЫ́ЙНЫ РЭЖЫ́М», «санацыя» (ад лац. sanatio аздараўленне), назва ў гіст. л-ры аўтарытарнага паліт. рэжыму ў Польшчы ў маі 1926 — вер. 1939. Устаноўлены ў выніку ваен.-дзярж. пераварота 12—13.5.1926 Ю.*Пілсудскага* і яго прыхільнікаў (прапагандавалі пераварот як народны і скіраваны супраць рэакцыі для аздараўлення эканомікі), падтрыманага *Польскай сацыялістычнай партыяй*, партыяй *«Вызволене»*, *Беларускай санацыяй* і інш. Хроналагічна ўмоўна падзяляецца даследчыкамі на 2 этапы: 1926—35 (ад пераварота Пілсудскага да яго смерці) і 1935—39 (час, калі пераемнікам Пілсудскага быў Э.*Рыдз-Сміглы*). У 1928—35 абапіраўся на *Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам*. Легітымізаваны канстытуцыяй Польшчы 1935. Абараняў інтарэсы польскіх магнатаў, быў адметны паліт. нестабільнасцю і частай зменай урадаў, варожа ставіўся да СССР, імкнуўся да супрацоўніцтва (з 1932) з Германіяй (гл. *Германа-польскі пакт 1934* аб ненападзе). Адмаўляў існаванне самаст. бел. этнасу ў польскай дзяржаве, узмацніў паланізацыю насельніцтва *Заходняй Беларусі* і *Заходняй Украіны* (беларусаў, літоўцаў, украінцаў, яўрэяў і інш.), у т.л. праз жорсткае праследаванне тут нац.-вызв. і нац.-культ. руху (адносна беларусаў гл. ў арт. *Беларуская сялянска-работніцкая грамада, Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры, Беларускі нацыянальны камітэт*, у Вільні, *«Змаганне», Таварыства беларускай школы, Косаўскі расстрэл 1927, Асташынскае выступленне сялян 1932, Кобрынскае выступленне сялян 1933, Нарачанскіх рыбакоў выступленне 1935*). Спыніў існаванне ў пач. 2-й сусв. вайны ва ўмовах ваен. паражэння Польшчы.

Літ.: Краткая история Польши: С древнейших времен до наших дней. М., 1993; Лазько Р.Р. Перад патопам: Еўрап. палітыка Польшчы (1932—1939). Мн., 2000. *У.М.Міхнюк.*

САНА́ЦЫЯ (лац. sanatio лячэнне, аздараўленне) у праве, працэдура конкурснага вядзення справы, якая прадугледжвае пераход права ўласнасці, змену дагаворных і інш. абавязацельстваў, рэарганізацыю, рэструктурызацыю або аказанне фін. падтрымкі даўжніку. Ажыццяўляецца для аднаўлення яго ўстойлівай плацежаздольнасці і ўрэгулявання ўзаемаадносін даўжніка і крэдытораў ва ўстаноўленыя тэрміны. На Беларусі прадугледжана законам «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве)» ад 18.7.2000. Уводзіцца гасп. судом на падставе рашэння сходу крэдытораў ці па ўласнай ініцыятыве ў выпадках, прадугледжаных законам. Рашэнне гасп. суда аб С. падлягае неадкладнаму выкананню. Уводзіцца на тэрмін да 18 месяцаў з дня вынясення рашэння аб яе правядзенні, калі інш. не прадугледжана законам. Пасля заканчэння С. эканам. санкцыі за невыкананне плацежных абавязацельстваў, а таксама сумы прычыненых страт, якія даўжнік абавязаны выплаціць крэдытору, могуць быць прад'яўлены да выплаты ў памерах, што існавалі на дату адкрыцця працэдуры *банкруцтва*. *Г.А.Маслыка.*

САНА́ЦЫЯ ротавай поласці, комплекс лячэбна-прафілакт. мерапрыемстваў па аздараўленні ротавай поласці і папярэджванні стаматалагічных захворванняў. Уключае агляд ротавай поласці, ліквідацыю ачагоў інфекцыі і інтаксікацыі, лячэнне зубоў, пашкоджанай слізістай абалонкі, папраўку дэфармаваных зубоў і сківіц і пратэзаванне.

САН-ВАЛЯНЦІ́Н (San Valentín), гара ў Патагонскіх Андах, на Пд Паўд. Амерыкі, у Чылі. Выш. 4058 м. 5 ледавікоў альпійскага тыпу.

СА́НГА́ (Sangha, Sanga), рака ў Цэнтральнаафрыканскай Рэспубліцы і Рэспубліцы Конга (часткова па межах іх з Камерунам). Утвараецца ад сутокаў рэк Кадэі і Мамберэ, якія пачынаюцца на паўд. схілах нагор'я Камерун. Даўж. ад сутокаў каля 790 км, ад вытоку Кадэі каля 1300 км, пл. бас. каля 200 тыс. км^2. Асн. прытокі: Джа (справа) і Ліквала-оз-Эрб (злева). Сярэдні расход вады ад 700 м^3/с у сак. да 4250 м^3/с у кастр.—лістападзе. Суднаходная ад зліцця вытокаў.

САНГА́І, Сангай, Імперыя Гао, дзяржава ў 7—17 ст. ва ўсх. лукавіне р. Нігер (тэр. сучасных Малі і Нігера), этн. аснову якой складаў народ сангаі. Да 7 ст. існавала невял. княства С. са сталіцай у г. Кукія, правіцелі якога мелі тытул соні. З канца 9 ст. сталіца С. — г. Гао. У 13—14 ст. у васальнай залежнасці ад *Малі*. З канца 14 ст. пачаўся ўздым С. Пры соні Алі Беры [1469—92] заваяваны Тамбукту і Джэне і ўсталявана гегемонія С. ў сярэднім цячэнні р. Нігер. У 1493 уладу захапіў палкаводзец Мухамед Турэ [1493—1529], які прыняў тытул аскія. Найб. росквіту С. дасягнула пры аскіі Даудзе [1549—82], калі яго паліт. ўплыў пашырыўся ад ніжняга цячэння р. Сенегал да зах. мяжы *Канем-Борну*. У 1591 разгромлена мараканскімі войскамі, існавала да 1670-х г. як невял. княства ў раёне сучаснага г. *Ніямей* (Нігер).

САНГА́Й (Sangay), дзеючы вулкан на ўсх. схіле Усх. Кардыльеры Андаў у Эквадоры. Выш. 5230 м. Дзейнічае з 1728,

апошнія вывяржэнні ў 1966—75. На вяршыні С. вечныя снягі.

САНГА́ЙЛА (Songaila) Мікалас (5.9.1875, маёнтак Кузьміно, Пскоўская вобл., Расія — 12.9.1941), літоўскі архітэктар. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1894—1903) і ў Італіі. У 1908—15 выкладаў у політэхн. ін-це ў Пецярбургу, у 1921—41 — Літ. ун-це ў г. Каўнас. Паводле яго праектаў з рысамі рацыяналізму і неакласіцызму пабудаваны Літ. банк (1928, з арх. А.Функам і Ф.Візбарасам), фіз.-хім. факультэт ун-та (1937, не захаваўся) у Каўнасе, банкі ў гарадах Паневяжыс (1930), Біржай (1935), Мажэйкяй (1937) і інш., рэканструяваны Дзярж. т-р у Каўнасе (1923—25, з У.Дубянецкім).

САНГА́ЛА (Sangallo), сям'я італьянскіх архітэктараў і скульптараў эпохі Адраджэння. Нарадзіліся ў г. Фларэнцыя.

А. да **Сангала** Старэйшы. Касцёл Сан-Б'яджа каля Мантэпульчана ў Таскане.

Джуліяна да С. [сапр. Джамберці (Giamberti); 1445—20.10.1516], развіваў традыцыі Ф.*Брунелескі*, выразным па кампазіцыі пабудовам надаваў лёгкасць і вытанчанасць: касцёл Санта-Марыя дэле Карчэры ў Прата (1484—95), віла ў Поджа-а-Каяна каля Фларэнцыі (з 1485), шматлікія гар. ўмацаванні, у т.л. ў Поджа-Імперыяле (1488), Пізе і Ліворна (1509—12). Як скульптар блізкі да *Данатэла* (надмагіллі сям'і Сасеці ў капэле Сасеці касцёла Санта-Трыніта ў Фларэнцыі, 1486). Антоніо да С. Старэйшы (1455 ці 1463 — 17.12.1534), брат Джуліяна да С., шмат працаваў разам. З самаст. работ найб. значны касцёл Сан-Б'яджа каля Мантэпульчана ў Таскане (1518—45). Антоніо да С. Малодшы [сапр. Кардыяні (Cordiani); 1483—3.8.1546], пляменнік і вучань Джуліяна да С. і Антоніо да С. Старэйшага. З 1503 працаваў у майстэрні Д.*Брамантэ* ў Рыме. Пабудаваў гар. ўмацаванні ў Парме (з 1525) і інш. Пасля смерці Рафаэля стаў гал. архітэктарам *Рымскага сабора святога Пятра* (з 1520). Сталыя работы С. вылучаюцца масіўнасцю форм і цэласнасцю арх. аблічча: палац Фарнезе ў Рыме (з 1513, завершана Мікеланджэла і Дж. дэла Портам), банк Санта-Спірыта ў Рыме (1523—24).

САН-ГАНСА́ЛУ (São Gonçalo), горад на ПдУ Бразіліі, у бухце Гуанабара, прамысл. спадарожнік г. Рыо-дэ-Жанейра. Засн. ў 1647. Каля 1 млн. ж. (2000). Марскі порт. Прам-сць: цэм., металургічная, хім., нафтаперапр., харчовая.

САНГА́РСКІ ПРАЛІ́Ў, другая назва праліва *Цугару*.

САНГВІ́НІК [ад лац. sanguis (sanguinis) кроў], суб'ект, які мае адзін з чатырох асн. тыпаў *тэмпераменту* і характарызуецца высокай псіхічнай актыўнасцю, энергічнасцю, працаздольнасцю, хуткасцю і жвавасцю рухаў, разнастайнасцю і багаццем мімікі, хуткім тэмпам мовы. С. імкнецца да частай змены ўражанняў, лёгка і хутка адклікаецца на навакольныя падзеі, таварыскі. Эмоцыі, пераважна станоўчыя, хутка ўзнікаюць і змяняюцца. Адносна лёгка і хутка ён перажывае няўдачы. Пры неспрыяльных умовах і адмоўным выхаваўчым уплыве рухавасць можа перайсці ў адсутнасць засяроджанасці, неапраўданую паспешнасць учынкаў, павярхоўнасць.

САНГІ́ Уладзімір Міхайлавіч (н. 18.3.1935, стойбішча Набіль Сахалінскай вобл., Расія), ніўхскі пісьменнік. Скончыў Ленінградскі пед. ін-т (1959), Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1965). Піша на рус. і ніўхскай мовах. Аўтар зб-каў вершаў і паэм «Салёныя пырскі» (1962), «Легенда аб таполі» (1965); апавяд. і аповесцей «Ніўхскія легенды» (1961), «Блакітныя горы» (1962), «Ізгін» (1965), «Тынграй» (1970), «У царстве ўладароў» (1973), «Падарожжа ў стойбішча Лунва» (1985); раманаў «Несапраўдны гон» (1965), «Жаніцьба Кевонгаў» (1975); кн. нарысаў «Па астравах скарбаў» (1976). Для твораў характэрны лірызм, рэалістычнае адлюстраванне з'яў і падзей, псіхалагізм. На бел. мову асобныя творы С. пераклаў К.Кірэенка.

Тв.: Бел. пер. — Пара здабыч. Мн., 1978.

САНГІЛЕ́Н, Сенгілен, нагор'е ў Паўд. Сібіры, на ПдУ Рэспублікі Тыва, Расія. Водападзел рэк бас. Малога Енісея (Ка-Хем) і Тэс-Хем. Даўж. каля 230 км, найб. шыр. 120 км, выш. да 3276 м. Складзены з гнейсаў, крышт. сланцаў, мармурызаваных вапнякоў, прарваных інтрузіямі. Радовішчы жалезістых кварцытаў, нефелінаў, графіту, золата. Пераважае сярэднягорны рэльеф. На паўн. схілах — кедрова-лістоўнічныя лясы, на Пд і ў цэнтры ў глыбокаўрэзаных далінах — драўнінная расліннасць, на схілах — стэпы, якія на выш. 1800—200 м пераходзяць у горныя лугі і тундры.

САНГІ́Н Станіслаў (каля 1818 — 15.2.1863), адзін з кіраўнікоў *паўстання 1863—64*. Служыў чыноўнікам на Гродзеншчыне, пасля выхаду ў адстаўку кіраваў маёнткам у Бельскім пав. Чл. *Віленскай археалагічнай камісіі*. Выступаў у віленскім друку з артыкуламі па сельскай гаспадарцы і эканоміцы. Паплечнік К.Каліноўскага і В.Урублеўскага па Гродзенскай рэв.-дэмакр. арг-цыі. Удзельнічаў у выданні і распаўсюджванні газ. *«Мужыцкая праўда»*. У пач. 1863 як нам. гродзенскага ваяводы фарміраваў паўстанцкія атрады на сумежжы Беларусі і Польшчы, удзельнічаў у баях пад Сямяцічамі (6—7.2.1863), у партыз. рэйдзе Р.Рагінскага ў глыб Беларусі. Пасля захопу паўстанцамі г. Пружаны 13.2.1863 з групай байцоў аддзяліўся ад Рагінскага, каб вярнуцца пад Сямяцічы. Загінуў у баі каля в. Рэчыца Пружанскага пав.

Г.В.Кісялёў.

САНГІ́НА (франц. sanguine ад лац. sanguis кроў) у графіцы, матэрыял для малявання ў выглядзе алоўка без аправы. Натуральная С. (мінерал крывава-чырв. колеру) выкарыстоўвалася ў наскальных размалёўках палеаліту. Тэхніка малюнка С. склалася ў еўрап. мастацтве эпохі Адраджэння, найб. пашырылася ў 17—18 ст. у натурных малюнках. У наш час С. вырабляюць з кааліну і аксідаў жалеза з невял. дабаўленнем сувязных рэчываў. У малюнку дае цёплы мяккі колер (ад чырвона-рудога да цёмна-карычневага і фіялетавага), багатую тонавую гаму, дазваляе выкарыстоўваць растушоўку, штрыхі рознай інтэнсіўнасці (асабліва пры змочванні), лакальныя плямы; не патрабуе фіксацыі.

САНГІНЕ́ЦІ КАЙРО́ЛА (Sanguinetti Coirolo) Хуліо Марыя (н. 6.1.1936, Мантэвідэо), дзяржаўны і паліт. дзеяч Уругвая. Скончыў ун-т Рэспублікі (г. Мантэвідэо). Працаваў адвакатам і журналістам. З 1962 чл. уругвайскага парламента ад партыі «Каларада»; з 1981 лідэр, з 1983 ген. сакратар партыі «Каларада». У 1969—71 міністр прам-сці і гандлю, у 1972 — культуры і асветы Уругвая. У 1985—90 першы цывільны прэзідэнт Усх. Рэспублікі Уругвай пасля перыяду ваен. рэжыму.

САНГМІ́, абшчына ў Паўд. В'етнаме, дзе ў час в'етн. вайны (1964—73) амер. салдаты ў ходзе антыпартыз. аперацыі 16.3.1968 забілі каля 500 мірных жыхароў. Масавае забойства ў С. негатыўна паўплывала на знешнепаліт. пазіцыю ЗША і актывізавала антываен. настроі. 11—12.7.1972 у Мінску адбылася міжнар. сустрэча прыхільнікаў міру пад дэвізам «Няхай ніколі не паўтарыцца трагедыя Хатыні, Лідзіцы, Арадура, Хірасімы, Сангмі».

САНГУ́ШКІ, княжацкі род герба «Пагоня» ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Паходзілі ад Фёдара Альгердавіча (? — каля 1431), які меў сына Сангушку (памяншальны варыянт імя Аляксандр, Васіль або Сямён), родапачынальніка С. Валодалі маёнткамі ў асн. на Валыні. Ад сыноў Сангушкі Аляксандра і Міхаіла пайшлі лініі Сангушкі-Кашырскія і Сангушкі-Ковельскія. У 15—18 ст. займалі вышэйшыя дзярж. пасады ў ВКЛ і Польшчы. Напачатку вызнавалі правас-

лаўе, з 16 ст. пераходзілі ў каталіцтва. З Беларуссю найб. звязаны:

Васіль (?—1557?), сын Міхаіла Сангушкавіча. У 1543 перадаў каралеве Боне Ковельскі маёнтак узамен за Горваль каля Рэчыцы, Смаляны і Абольцы ў Віцебскім ваяв., стварыўшы буйную латыфундыю С. на Беларусі; трымаў Свіслацкую дзяржаву. Андрэй Міхайлавіч (?—4.10.1560), сын Міхаіла Аляксандравіча, маршалак гаспадарскі ў 1522—53, спраўца Кіеўскага ваяв. ў 1540—42, староста луцкі ў 1542—59. Аляксандр (каля 1508—1565), сын Андрэя Міхайлавіча, дзяржаўца гомельскі ў 1535—36, маршалак гаспадарскі з 1547. Раман (каля 1537—12.5.1571), сын Фёдара, староста жытомірскі з 1557, ваявода брацлаўскі з 1566, адначасова гетман дворны (польны) ВКЛ з 1569, староста рэчыцкі з 1568. Удзельнічаў у Інфлянцкай вайне 1558—82. Падпісаў акт *Люблінскай уніі 1569*. Самуэль Сямён (Шыман Самуэль; ? — ліст. 1638), сын Андрэя, маршалак аршанскі ў 1620, кашталян мсціслаўскі ў 1620—21 і віцебскі ў 1621—26, ваявода віцебскі з 1626. У Смалянах пабудаваў замак Белы Ковель (гл. *Смалянскі замак*). Казімір Антоній (1677—30.5.1706), сын Гераніма, маршалак дворны ВКЛ у 1702—03 і маршалак вялікі ў 1703. Павел Кароль (1680—14/15.4.1750), сын Гераніма, стольнік ВКЛ у 1708—09, падскарбі дворны ў 1711—13, маршалак дворны ў 1713—34 і маршалак вялікі з 1734. У 1733 прэтэндэнт на трон Рэчы Паспалітай. Януш Аляксандр (5.5.1712—13.9.1775), сын Паўла Караля, мечнік ВКЛ у 1735—50, маршалак дворны ў 1750—60. Юзаф Паўлін Ян Адам (20.6.1740—12.5.1781), сын Паўла Караля, староста крамянецкі ў 1752—80, маршалак дворны ВКЛ у 1760—68 і вялікі з 1768. Геранім Януш (4.3.1743—4.9.1812), сын Паўла Караля, ген.-паручнік войска ВКЛ (1775), мечнік ВКЛ у 1775, ваявода валынскі з 1775. Выступаў супраць *Канстытуцыі 3 мая 1791*. Далучыўся да *Таргавіцкай канфедэрацыі* і атрымаў чын ген.-паручніка рас. арміі (1793). Удзельнічаў у *паўстанні 1794*, у Гродне прыняў камандаванне над войскам ВКЛ і прывёў яго на абарону Варшавы.

САНГХА (санскр. літар. грамадства), будыйская абшчына, членамі якой з'яўляюцца манахі (біккху) ці манашкі (біккхуні; гл. *Будызм*). С. ўзніклі ў 5—4 ст. да н.э. ў Стараж. Індыі. Існуюць мужчынскія (найб. пашыраны) і жаночыя. Членам С. можа стаць кожная асоба па дасягненні 20-гадовага ўзросту незалежна ад расы, нацыянальнасці, касты, сац. становішча; выключэнне складаюць ваеннаслужачыя, даўжнікі, заразныя ці псіхічна хворыя. Тэрмін знаходжання ў С. вызначаецца асобай, якая жадае манастваваць (звычайна не менш як месяц). Манахі С. не з'яўляюцца свяшчэннаслужыцелямі; свой час прысвячаюць чытанню і літар. запамінанню свяшчэнных тэкстаў, вывучэнню санскрыту, медытацыі, размовам з вернікамі. Члены С. падпарадкоўваюцца адзіным правілам (Віная-пітакі), але кожнаму будыйскаму рэгіёну ўласцівы асаблівасці ў практыцы і ладзе жыцця С. Тэрмінам «С.» таксама абазначаюць усіх будыйскіх манахаў свету ці пэўнай *будыйскай школы*, краіны, манастыра, храма.

САНД (Sand) Жорж [сапр. Дзюпэн (Dupin) Аўрора; па мужу Дзюдэван (Dudevant); 1.7.1804, Парыж — 8.6.1876], французская пісьменніца. Вучылася ў англ. каталіцкім манастыры ў Парыжы. Дэбютавала псіхал. раманам «Індыяна» (1832), у якім тэма жаночай эмансіпацыі цесна звязана з праблемай свабоды чалавека. У раманах «Валянціна» (1832), «Лелія» (1833), «Жак» (1834) у традыцыях байранізму і «нястрымнага рамантызму» абвясціла індывідуалістычны бунт як адзіны шлях у абнаўленні грамадства. На мяжы 1830—40-х г.

Ж.Санд.

С.Сандзецкіс.

захапілася ідэямі утапічнага і хрысц. сацыялізму. Аўтар сац. раманаў «Мапра́» (1837), «Вандроўны падмайстар» (1840), «Арас» (1841), «Млынар з Анжыбо» (1845), «Грэх пана Антуана» (1847), дылогіі «Кансуэла» (1842—43) і «Графіня Рудальштат» (1843—44). Дэмакр. погляды С. выявіліся ў цыкле вясковых аповесцей («Чортава лужына», 1846; «Франсуа-знайдыш», 1847—48; «Маленькая Фадэта», 1848—49). Удзельніца рэвалюцыі 1848, пасля перамогі рэакцыі адышла ад палітыкі. Аўтар мемуараў «Гісторыя майго жыцця» (1854—55), шматлікіх раманаў, у т.л. «Снегавік» (1858), «Апошняе каханне» (1867) і інш. Аповесць «Францыя» (1872) пра гіст. падзеі 1812—14 у Францыі і Беларусі.

Тв.: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—9. Л., 1971—74.

Літ.: Моруа А. Жорж Санд: Пер. с фр. М., 1968; Трапезникова Н.С. Романтизм Жорж Санд. Казань, 1976; Трескунов М.С. Жорж Санд: Критико-биогр. очерк. Л., 1976. *Т.У.Кавалёва.*

САНДА́Л СІ́НІ, тое, што *кампешавае дрэва*.

САНДА́ЛАВАЕ ДРЭ́ВА, тое, што *кампешавае дрэва*.

САНДА́ЛАЎ Леанід Міхайлавіч (10.4.1900, г. Вічуга Іванаўскай вобл., Расія — 23.10.1987), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, ген.-палкоўнік (1944). Скончыў ваен. акадэміі імя Фрунзе (1934), Генштаба (1937). У Чырв. Арміі з 1919. З вер. 1937 у БВА, нач. штаба, камандуючы арміяй, нач. штаба Цэнтр. фронту. У пач. Вял. Айч. вайны ўдзельнік абарончых баёў каля Брэста, Баранавічаў, Прапойска (цяпер Слаўгарад). У 1941—45 нач. штаба розных франтоў. Да 1953 на камандных пасадах у Сав. Арміі. Аўтар шэрагу мемуараў.

САНДАМІ́Р, Сандомеж (Sandomierz), горад на ПдУ Польшчы, на р. Вісла, у Свентакшыскім ваяводстве. Вядомы з 8 ст. Каля 30 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог, рачны порт. Прам-сць: шкляная (найбуйн. цэнтр у краіне), харч., камбікормавая, суднабудаўнічая. Вышэйшая духоўная семінарыя. Дыяцэзіяльны музей. Раманскі (13 ст.) і гатычны (14—17 ст.) касцёлы, гатычныя дамы, ратуша (14—16 ст.). Турызм.

САНДАМІ́РСКІ Сяргей Рыгоравіч (н. 27.9.1956, Кіеў), бел. вучоны ў галіне фізікі неразбуральнага кантролю. Д-р тэхн. н. (1994). Чл. Нью-Йоркскай АН (1995). Скончыў БДУ (1978). З 1978 у Ін-це прыкладной фізікі (з 1996 заг. лабараторыі), з 1999 у Ін-це надзейнасці машын (заг. лабараторыі) Нац. АН Беларусі. Навук. працы па метадах магн. кантролю фіз.-мех. уласцівасцей вырабаў. Распрацаваў аналіт. апісанне працэсаў перамагнічвання ферамагн. цел з улікам размагнічвальнага ўплыву іх формы.

Тв.: Остаточная намагниченность ферромагнитного тела, намагниченного в разомкнутой магнитной цепи // Дефектоскопия. 1997. № 8; Изменение чувствительности магнитного метода контроля физико-механических свойств сталей при намагничивании изделий в разомкнутой магнитной цепи // Там жа. 1998. № 7.

САНДАМІ́РСКІ ПЛАЦДА́РМ, аператыўны плацдарм, захоплены сав. войскамі 1-га Укр. фронту (Маршал Сав. Саюза І.С.Конеў) 29 ліп. — 29. жн. ў ходзе *Львоўска-Сандамірскай аперацыі 1944* на зах. беразе р. Вісла ў раёне г. Сандамір (Польшча). У студз. 1945 войскі 1-га Укр. фронта з С.п. пачалі наступленне ў Сандамірска-Сілезскай аперацыі 1945 (частка *Вісла-Одэрскай аперацыі 1945*).

САНДВІЧАВЫ АСТРАВЫ́, другая назва *Гавайскіх астравоў*.

САНДЗЕ́ЦКІС (Sondeckis) Саўлюс (н. 11.10.1928, г. Шаўляй, Літва), літоўскі дырыжор, скрыпач, педагог. Нар. арт. Літвы (1974). Нар. арт. СССР (1980). Скончыў Літ. кансерваторыю (1952). У 1955—86 выкладчык Вільнюскай школы мастацтваў імя М.Чурлёніса і кіраўнік яе струннага аркестра. Адначасова з 1957 выкладчык Літ. кансерваторыі (з 1977 праф., у 1959—87 заг. кафедры); з 1971 кіраўнік студэнцкага камернага аркестра. З 1960 маст. кіраўнік і дырыжор

арганізаванага ім Літ. камернага аркестра. З 1992 кіруе створаным ім камерным аркестрам «Санкт-Пецярбург—Камерата». Творчасці С. ўласцівы вытанчаны мастацкі густ, эрудыцыя, пачуццё стылю муз. твораў. Аўтар транскрыпцый для камернага аркестра, музыказнаўчых артыкулаў. Дзярж. прэмія Літвы 1971. Дзярж. прэмія СССР 1987.

Л.А.Шымановіч.

САНДЗІ́НА (Sandino) Аўгуста Сесар (18.5.1895, Нікінаома, каля г. Масая, Нікарагуа — 21.2.1934), дзеяч нац.-вызв. руху Нікарагуа. Рабочы на шахтах і рудніках у Нікарагуа, Гандурасе, Гватэмале і Мексіцы. У кастр. 1926 арганізаваў паўстанне рабочых залатых прыіскаў Сан-Альбіна супраць акупацыі Нікарагуа войскамі ЗША. Узначаліў паўстанцкую армію, якая да 1931—32 налічвала 6 тыс. чал. і кантралявала значную ч. тэр. Нікарагуа. Запрошаны на мірныя перагаворы з новым урадам краіны, арыштаваны па загадзе камандуючага нац. гвардыяй А.Самосы Гарсія і расстраляны. У яго гонар названы *Сандзінісцкі фронт нацыянальнага вызвалення* ў Нікарагуа.

Літ.: Гонионский С.А. Сандино. М., 1965; Идейное наследие Сандино: Пер. с исп. М., 1982; Гутьеррес Дуарте М.А. Аугусто С.Сандино. М., 1991.

САНДЗІНІ́СЦКІ ФРОНТ НАЦЫЯНА́ЛЬНАГА ВЫЗВАЛЕ́ННЯ (El Frente Sandinista de Liberación Nacional), левая паліт. партыя ў Нікарагуа. Створаны ў 1961 групай левых нікарагуанскіх дзеячаў на чале з К.Фансекам Амадорам. Ставіў мэтай адхіленне ад улады ў Нікарагуа алігархічнага рэжыму на чале з сямейным кланам *Самоса*, ажыццяўленне дэмакр. і сац. рэформ. З канца 1960-х г. вёў узбр. барацьбу супраць рэжыму А.*Самосы Дэбайле*, узначаліў *Нікарагуанскую рэвалюцыю 1979*. Пасля перамогі рэвалюцыі ператварыўся ў паліт. партыю і сфарміраваў урад Нікарагуа, які ажыццявіў шэраг рэформ сацыяліст. ўзору. З 1990, пасля паражэння на прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбарах, у апазіцыі.

САНДО́МЕЖ (Sandomierz), горад у Польшчы, гл. *Сандамір*.

СА́НДРЫК, дэкаратыўная арх. дэталь у выглядзе невял. прафіляванага (прамавугольнага або выгнутага) карніза над аконным ці дзвярным праёмам на фасадзе будынка (радзей у інтэр'ерах). Часам апіраецца на кансолі і завяршаецца франтонам. Вядомы са старажытнасці (манум. ордэрная архітэктура Стараж. Грэцыі і Рыма). Пашыраны ў архітэктуры рэнесансу і інш. стыляў.

САНДРЭ́ЛІ (Sandrelli) Стэфанія (н. 5.6.1946), італьянская актрыса. Прывабліві выгляд, абаянне маладосці прынеслі ёй поспех у фільмах «Развод па-італьянску» (1961), «Спакушаная і пакінутая» (1964). Адкрытая эратычнасць яе гераіні спалучаецца з інтэлектуальна-вытанчанай манерай выканання ў фільмах «Амаральны» (1967), «Канфарміст» (1970), «Мы так кахалі адзін аднаго» (1975), «Дваццатае стагоддзе» (1976), «Тэраса» (1979) і інш. У 1980—90-я г. здымалася пераважна ў меладрамах і дэтэктывах.

САН-ДЫЕ́ГА (San Diego), горад на Пд Ціхаакіянскага ўзбярэжжа ЗША, каля граніцы з Мексікай, у штаце Каліфорнія. Засн. іспанцамі ў 1769. 1220,7 тыс. ж., з прыгарадамі больш за 3 млн. ж. (2000). Марскі порт, вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Цэнтр цытрусаводчага раёна, авіяракетнай прам-сці і вытв-сці касмічных лятальных апаратаў. Прам-сць: радыёэлектронная, у т.л. вытв-сць ЭВМ і абсталявання, пераважна для ваенных мэт; суднабуд. прыладабуд., металаапр., хім., плодакансервавая. 9 ун-таў. Ін-т акіянаграфіі. Кліматычны курорт. У парку Бальбоа адзін з буйнейшых у свеце заапаркаў. Гал. ваенна-марская база ЗША на Ціхім ак.

СА́НДЭРЛЕНД (Sunderland), горад у Вялікабрытаніі, на ПнУ Англіі, у канурбацыі Тайнсайд. Каля 300 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт на Паўночным м. ў вусці р. Уір (увоз драўніны, вываз вугалю). Прам-сць: суднабуд., вытв-сць суднавых рухавікоў; эл.-тэхн., шкляная, швейная, папяровая. Паблізу здабыча каменнага вугалю.



Сандрык.

САНЕ́ЕЎ Віктар Данілавіч (н. 3.10.1945, г. Сухумі, Грузія), грузінскі і расійскі спартсмен (лёгкая атлетыка, трайны скачок). Засл. майстар спорту СССР (1968). Скончыў Груз. ін-т субтрапічнай гаспадаркі. Аграном. Чэмпіён XIX, XX і XXI Алімп. гульняў (1968, Мехіка; 1972, г. Мюнхен, Германія; 1976, г. Манрэаль, Канада), сярэбраны прызёр XXII Алімп. гульняў (1980, Масква). Чэмпіён Еўропы 1969, 1974; у закрытых памяшканнях — 1970, 1971, 1975, 1976, 1977. Сярэбраны прызёр чэмпіянатаў Еўропы 1971, 1978. Чэмпіён СССР 1968, 1969, 1970, 1971, 1973, 1975, 1987. Рэкардсмен свету 1968, 1971, 1972, 1973, 1974, 1975.

А.М.Петрыкаў.

САНЕ́Т (італьян. sonetto ад правансальскага sonet песенька), адна з цвёрдых форм верша; верш з 14 радкоў: двух катрэнаў (4-радкоўяў) і двух тэрцэтаў (3-радкоўяў). Памер — 5-стопны, радзей 4- ці 6-стопны ямб. Радкі ў катрэнах рыфмуюцца па схемах: абба абба ці абаб абаб, у залежнасці ад іх рыфмы ў тэрцэтах размяшчаюцца: ввг дгд ці ввг ддг. Першы катрэн — экспазіцыя, у ім намячаецца тэма верша, развіццё якой складае змест другога 4-радкоўя. На першы тэрцэт прыпадае кульмінацыя, на заключны — развязка. Асаблівая роля належыць апошняму радку, т. зв. санетнаму замку — своеасабліваму ідэйнаму ключу ўсяго верша. У класічнай форме С. дапускаецца ўжыванне аднаго і таго ж слова (за выключэннем службовых) толькі адзін раз.

С. узнік у Італіі ў 1-й пал. 13 ст., росквіту дасягнуў у творчасці Дантэ, Ф.Петраркі, развіўся ўісп., партуг., франц., англ. і інш. зах.-еўрап. л-рах. У рус. паэзію ўведзены В.К.Традзьякоўскім. Карысталіся гэтай формай В.Жукоўскі, А.Пушкін і інш. Музычнасцю мовы вызначаюцца «Крымскія санеты» А.Міцкевіча. Напачатку С. належаў да інтымнай лірыкі. У.Шэкспір напоўніў яго філас. зместам, абнавіў форму.

У бел. паэзію С. увёў Я.Купала («Жніво», «Па межах родных і разорах», «Запушчаны палац», усе нап. 1910). Пэўны ўклад у развіццё С. зрабіў М.Багдановіч. У арт. «Санет» ён разглядаў не толькі страфічную структуру гэтага тыпу верша, але і яе сэнсавыяўленчыя магчымасці. Узорам у бел. л-ры лічыцца С. Багдановіча «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі». С. — пашыраная форма верша ў бел. паэзіі. Вядомыя санеты З.Бядулі («Тут неба — даль бязбрэжная, як мора»), У.Жылкі («Сёмуха», «Каханне», «Харство»), П.Труса («Над кубкам возера»), М.Танка («Санет», «У век рэвалюцыйны, штармавы», «Трэска з дома Шэкспіра»), У.Дубоўкі («Ля Мядзела ёсць возера адно»), А.Звонака («Паэзія», «Вернасць», «Слава», «Жаданне») і інш. С. сустракаецца ў паэзіі Р.Барадуліна, Э.Валасевіча, С.Грахоўскага. Хв.Жычкі, К.Кірэенкі, Я.Сіпакова, М.Федзюковіча і інш.

Літ.: Барычэўскі А. Тэорыя санету. Мн., 1927. *А.А.Майсейчык.*

САН-ЖУА́Н-ДЫ-МЕРЫТЫ́ (São João de Meriti), горад на ПдУ Бразіліі, паўн.-зах.

прыгарад Рыо-дэ-Жанейра. Каля 500 тыс. ж. (2000). Трансп. вузел. Прам-сць: маш.-буд., хімічная. Цэнтр раёна прыгараднай гаспадаркі, які забяспечвае Рыо-дэ-Жанейра агароднінай і фруктамі.

СА́НІ, палазовы трансп. сродак, які шырока выкарыстоўваецца зімой, калі ўстанаўліваецца снежнае покрыва. С. возяць коні, алені, сабакі. Да С. адносяцца простыя С., *нарты* народаў Поўначы і розныя віды С. з кузавам. С. больш старажытныя, чым калёсная павозка, яны былі вядомы не толькі ў паўн. народаў, але і ў паўд. краінах. С. выкарыстоўвалі ў пахавальным абрадзе ў Стараж. Егіпце і Стараж. Русі. У сярэдневякоўі важныя службовыя асобы рабілі ўрачыстыя выезды на С. і летам. Існуюць таксама С. і без палазоў: некат. віды *валакушы*, табаган канадскіх індзейцаў і інш. У наш час у розных галінах гаспадаркі на Крайняй Поўначы



Сані.

выкарыстоўваюць *аэрасані*. С. выкарыстоўваюцца таксама ў спарт. мэтах (гл. *Санны спорт*).

На Беларусі архаічныя С. мелі натуральныя, крыху выгнутыя кверху палазы з абрубкамі сукоў, што выконвалі функцыю капылоў. Эвалюцыя С. ішла па шляху функцыянальнага і сац. размежавання, што абумоўлівала іх тыпалагічную разнастайнасць і канструкцыйныя асаблівасці. Паводле прызначэння ўсе С. можна падзяліць на некалькі тыпаў: звычайныя рабочыя, *кары* (лесавозы), выязныя (вазкі) і ручныя (санкі). Найб. пашыраны былі рабочыя С. У тыповым варыянце ўяўлялі сабой 2 палазы, злучаныя па капылах гнуткімі (часцей дубовымі) вязамі, якія загіналіся канцамі на 180° вакол пары процілеглых капылоў. Паўзверх вязаў на канцы капылоў паралельна полазу набіваліся драўляныя брускі (намарзня, намаржня, наклеска). У адным выпадку палазы мелі натуральна выгнутую галоўку (копанкі, копані), у другім — іх гнулі пасля распаркі з дубовага, ясеневага, вязавага дрэва на спец. прыстасаванні — гбале (шаблон па форме полаза, высечаны ў калодзе або зроблены на сцяне пабудовы). Выгнутую форму фіксавала іцвіна (папліска) — хордавая перакладзіна, што злучала галоўку полаза з пярэднім капылом. За пярэднія капылы нярэдка мацавалі і аглоблі для коннай ці валовай запрэжкі. Перакрыццё С. утваралі дошкі ці луб, што накладваліся паверх вязоў. Для павелічэння пагрузачнай пляцоўкі ўладкоўвалі *развалкі* (розвальні). У сял. гаспадарцы рабочыя С. выконвалі універсальныя функцыі. Адносная лёгкасць канструкцыі дазваляла выкарыстоўваць іх для пасажырскай язды, пры гэтым у задняй частцы С. устанаўлівалі трохбаковую кроцістую драбінку накшталт кузава вазка. Пры перавозцы малагабарытных і сыпкіх грузаў, паездцы на мясц. рынак і інш. паверх С. ставілі плецены паўкош (палукаш). Рабочыя С. выкарыстоўвалі замест караў пры перавозцы лесу; для гэтага на намаржні ўпоперак С. мацавалі тоўсты брусок (лісіцу), на які клалі камлёвую частку бервяна, а пад верхавіну падводзілі падсанкі, якія амаль не адрозніваліся па форме ад рабочых С., але мелі меншыя памеры. Іх выкарыстоўвалі для розных дробных перавозак, работы каля дому, у святочных катаннях і інш.

Выраб С. нярэдка вылучаўся ў самаст. промысел. У панскіх маёнтках і дзярж. эканоміях існавалі асобныя «службы санніцкія», майстры якіх былі вызвалены ад цяглавых павіннасцей. Напр., паводле інвентара Ваўкавыскага двара, саннікі складалі асобны пасёлак з 8 службаў. Санны промысел быў пашыраны ў сельскай мясцовасці як вытв-сць на заказ і на рынак. Часта ён існаваў неаддзельна ад стальмашнага рамяства, што тлумачылася падобнай тэхналогіяй і універсальнымі навыкамі майстроў. У пач. 20 ст. пашырылася кааперацыя саннага і кавальска-слясарнага промыслаў: у С. павялічвалася колькасць жал. дэталей, на якія прыпадала найб. эксплуатацыйная нагрузка; палазы сталі больш тонкія і падбіваліся паласавым жалезам; іцвіны замянялі жал. стрыжнямі; акоўка давала магчымасць шырэй выкарыстоўваць замест вязоў брусковыя папярочнікі. У наш час традыц. С. ўжываюцца ў сельскім побыце пры перавозках на кароткія адлегласці і ў асабістых гаспадарках. *В.С.Цітоў.*

САНІДЗІ́Н [ад грэч. sanis (sanidos) таблічка, дошка], пародаўтваральны мінерал з групы *палявых шпатаў*, каліевананатрыевы алюмасілікат (K, Na)$AlSi_3O_8$. Мае прымесі кальцыю і барыю. Крышталізуецца ў манаклінная сінганіі. Утварае крышталі таблітчастыя да пласціністых, характэрны двайнікі прарастання (асабліва карлсбадскія). Бясколерны, вадзяна-празрысты. Цв. 6. Шчыльн. 2,6 г/см^3.

Санідзін.

Крохкі. Магматычнага паходжання. Выкарыстоўваецца ў керамічнай прам-сці, высакаякасная сыравіна для электракерамікі, вытв-сці гліназёму, калійных угнаенняў, пяташу. Радовішчы ў Расіі, ЗША, Германіі, Італіі і інш.

САНІ́ТА, балота нізіннага і мяшанага тыпаў у Ганцавіцкім, Іванцэвіцкім і часткова Пінскім р-нах Брэсцкай вобл., у вадазборы р. Бобрык. Пл. 12,5 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 1,5 тыс. га. Глыб. торфу да 3,7 м, сярэдняя 1,1 м. Запасы торфу 2,9 млн. т. Асушана 4,5 тыс. га. Асушаныя землі выкарыстоўваюць пад ворыва і сенажаць. На неасушаных землях пераважаюць зараснікі вярбы, вольхі, бярозы; на асобных участках асокі, разнатраўе.

САНІТА́РНА-АХО́ЎНАЯ ЗО́НА, санітарны разрыў, участак тэрыторыі паміж прамысл. прадпрыемствам і жыллёвымі масівамі для аховы жылых зон ад уздзеяння шкодных вытв. фактараў (шум, пыл, газападобныя выкіды, вібрацыя і інш.).

На Беларусі шырыня С.-а.з. ўстанаўліваецца з разлікам, каб выкіды прадпрыемства, якія дасягаюць раёнаў жыллёвай забудовы, не перавышалі гранічна дапушчальных канцэнтрацый (ГДК) забруджвальных рэчываў у атм. паветры населеных тэрыторый і 0,8 ГДК у месцах масавага адпачынку (курортныя зоны, санаторыі, пляжы, паркі і інш.). Выходзячы са шкоднасці выкідаў, дасканаласці тэхнал. працэсаў, наяўнасці ачышчальных збудаванняў усе прадпрыемствы падзяляюць на класы: з шыр. С.-а.з. 1000 м — 1-ы кл., 500 м — 2-і кл., 250 м — 3-і кл., 100 м — 4-ы кл., 50 м — 5-ы кл. Гэтыя памеры адпавядаюць макс. выкідам, меншым за ГДК. Шыр. С.-а.з. можа быць павялічана пры тэхн.-эканам. і гігіенічным абгрунтаванні, але не больш, чым у 3 разы. Для прадпрыемстваў, дзе выкарыстоўваюць радыеактыўныя рэчывы і крыніцы іанізавальнага выпрамянення, С.-а.з. ўстанаўліваецца ў адпаведнасці з сан. правіламі працы з гэтымі рэчывамі. С.-а.з. азеляняюць газаўстойлівымі раслінамі. *П.І.Лабанок.*

САНІТА́РНА-ЭПІДЭМІЯЛАГІ́ЧНАЯ СЛУ́ЖБА, спецыялізаваная сістэма дзярж. устаноў аховы здароўя. Ажыццяўляе *санітарны нагляд*, распрацоўку і правядзенне санітарна-прафілакт. і процізпідэмічных мерапрыемстваў з мэтай забеспячэння аховы здароўя насельніцтва. На Беларусі дзейнасць С.-э.с. рэгламентуецца Законам «Аб санітарна-эпідэміялагічным дабрабыце насельніцтва» (2000). Асн. кірункі дзейнасці: гігіенічная ацэнка новых тэхналогій і інш. у нар. гаспадарцы, нарміраванне гранічна дапушчальных канцэнтрацый шкодных рэчываў і метадаў кантролю за імі, аздараўленне ўмоў працы, быту і адпачынку насельніцтва. Задачы службы: прадухіленне і ліквідацыя забруджвання навакольнага асяроддзя, зніжэнне і ліквідацыя інфекц. і паразітарных хвароб і інш. У сістэму ўстаноў С.-э.с. ўваходзяць: аддзел гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Мін-ва аховы здароўя, рэсп., абл., гар., раённыя цэнтры «Зда-

роўе», рэсп. і абл. цэнтры па прафілактыцы СНІДу, цэнтры дэзінфекцыі і стэрылізацыі і інш. *Э.А.Вальчук.*

САНІТА́РНАЯ АСВЕ́ТА, пашырэнне гігіенічных і мед. ведаў сярод насельніцтва пра фарміраванне свядомага і здаровага ладу жыцця; частка дзярж. сістэмы *аховы здароўя*. Грунтуецца на мед. дысцыплінах: педагогіцы, псіхалогіі, сацыялогіі і інш. Асн. ролю ў арганізацыі С.а. адыгрываюць установы *санітарна-эпідэміялагічнай службы*. С.а. ўключае: дзярж. фінансаванне, падрыхтоўку кадраў, развіццё матэрыяльна-тэхн. базы, навуковасць, масавасць і г.д. У канцы 1990 — пач. 2000-х г. набыла актуальнасць барацьба з курэннем, злоўжываннем алкаголю, гіпадынаміяй, нерацыянальным харчаваннем і г.д. Барацьба са СНІДам патрабуе растлумачальнай работы сярод насельніцтва пра фактары рызыкі перадачы віруса імунадэфіцыту чалавека і інш. *М.В.Шчавелева.*

САНІТА́РНАЯ АХО́ВА, сістэма заканадаўчых, арганізацыйных і санітарна-тэхн. мерапрыемстваў па прадухіленні забруджвання навакольнага асяроддзя і абмежаванні ўздзеяння неспрыяльных фактараў асяроддзя на здароўе насельніцтва. На Беларусі праблемамі С.а. займаюцца Мін-ва аховы здароўя, *санітарна-эпідэміялагічная служба* і яе падраздзяленні, Мін-ва прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і інш. Вядзецца сацыяльна-гігіенічны *маніторынг*, у т.л. назіранні за выкідамі шкодных прамысл. рэчываў. Даюцца рэкамендацыі па рацыянальным размяшчэнні прадпрыемстваў, укараненні неабходных тэхналогій, дапушчальнай колькасці ў навакольным асяроддзі прамысл. выкідаў і інш. Пытанні С.а. рэгламентуюць: Кодэкс Беларусі аб зямлі (1990), законы «Аб ахове атмасфернага паветра» (1981), «Аб санітарна-эпідэміялагічным дабрабыце насельніцтва» (2000) і інш. *М.В.Шчавелева.*

САНІТА́РНАЯ АХО́ВА ГРАНІ́Ц, санітарная ахова тэрыторыі, комплекс рэгламентаваных адм. і сан.-проціэпідэміял. мерапрыемстваў, накіраваных на прадухіленне завозу (заносу) у краіну *карантынных хвароб* жывёл і чалавека. Ажыццяўляецца ў міжнар. аэрапортах і марскіх (рачных) партах, на пагранічных чыг. станцыях і аўтадарожных магістралях.

Уключае забарону на ўезд людзей, атрыманне пасылак з краін, небяспечных у эпідэміялагічных адносінах па чуме, халеры; закрыццё дзярж. граніцы ў выпадку з'яўлення чумы або халеры ў суседніх краінах, сан. агляд транспарту, мед. агляд пасажыраў і інш. Ажыццяўляецца *санітарна-эпідэміялагічнай службай*. Адносна карантынных хвароб С.а.г. праводзіцца паводле міжнар. сан. правіл, шэрагу міжнар. пагадненняў. Гл. таксама *Карантын*.

САНІТА́РНАЯ ТЭ́ХНІКА, сантэхніка, галіна тэхнікі, якая займаецца добраўпарадкаваннем побыту, умоў прац. дзейнасці і адпачынку насельніцтва, адпаведных патрабаванням *санітарыі*. У больш вузкім сэнсе — сукупнасць тэхн. сродкаў, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэм *водазабеспячэння, каналізацыі, ацяплення, цеплазабеспячэння, газазабеспячэння, вентыляцыі, кандыцыянiравання* паветра, *ачысткі сцёкавых водаў* у жылых, грамадскіх, прамысл. будынках, збудаваннях, на тэр. нас. пунктаў і прадпрыемстваў.

У С.т. шырока выкарыстоўваюцца разнастайныя санітарныя прылады: гігіенічныя (умывальнікі, ванны, унітазы і інш.), гаспадарчыя (кухонныя ракавіны, мыйкі), прылады лазняў, дзіцячых і мед. устаноў, вытв. памяшканняў, трансп. сродкаў, лабараторый і інш. Робяцца керамічныя (з фаянсу, паўфарфору), пластмасавыя, стальныя, эмаліраваныя і інш.; аснашчаюцца водазаборнай і змешвальнай сантэхнічнай арматурай, кранамі і вадзянымі засаўкамі. Далучаюцца да ўнутр. (дамавых) сетак водаправода і каналізацыі.



Прыстасаванні **санітарнай тэхнікі**: а — водазаборны кран (1 — клапан, 2 — галоўка, 3 — затычка сальніка, 4 — шток, 5 — злiў); б — вентыльная галоўка (1 — шток, 2 — сальнікавая ўтулка, 3 — сальнікавая набіўка, 4 — корпус галоўкі, 5 — клапан з пракладкай); в — разнавіднасці клапанаў з пракладкамі (1 — пракладка, 2 — клапан).

САНІТА́РНЫ АЎТАМАБІ́ЛЬ, аўтамабіль для перавозкі і эвакуацыі хворых, пацярпелых пры аварыях і катастрофах, для лячэбна-прафілактычнага і лячэбна-эвакуацыйнага абслугоўвання насельніцтва і войск у мірны і ваенны час.

Асн. патрабаванні: зручнасць пагрузкі і выгрузкі хворых і пацярпелых, магчымасць іх транспарціроўкі ў становішчы лежачы і седзячы, мінім. трасенне і гайданне кузава, высокая плаўнасць ходу, адсутнасць вібрацыі, манеўранасць, высокая праходнасць. Ёсць таксама С.а., абсталяваныя перавязачным сталом, кіслародна-дыхальнай і наркознай апаратурай, прыладамі для пералівання крыві, электракардыёграфамі і інш. Для эвакуацыі вял. колькасці хворых і параненых прыстасоўваюць пасаж. аўтобусы. Як санітарны транспарт выкарыстоўваюць таксама спец. паязды, самалёты, верталёты, рачныя і марскія судны, аэрасані.

САНІТА́РНЫ НАГЛЯ́Д, сістэма пастаяннага назірання за выкананнем прадпрыемствамі, установамі, асобамі сан. норм і правіл; асн. функцыя *санітарна-эпідэміялагічнай службы*, накіраваная на прафілактыку захворванняў. Адрозніваюць С.н. папераджальны і бягучы. Папераджальны ўключае папярэднюю гігіенічную ацэнку норм праектавання, стандартаў, тэхн. умоў, новых рэчываў і вырабаў, планіроўкі і забудовы нас. пунктаў і інш.; бягучы С.н. — рэгулярны планавы кантроль за аб'ектамі камунальнай гаспадаркі, прамысл. прадпрыемствамі, аб'ектамі харчавання, дзіцячымі дашкольнымі, школьнымі і інш. ўстановамі, крыніцамі радыеактыўных рэчываў і інш. Гал. яго мэта — распрацоўка прапаноў і мерапрыемстваў па ліквідацыі або прадухіленні забруджвання глебы, вадаёмаў, атм. паветра, аздараўленні ўмоў працы, быту і адпачынку насельніцтва. Праводзяць С.н. сан.-гігіенічныя і бактэрыял. лабараторыі.

Літ.: Социальная гигиена (медицина) и организация здравоохранения. Казань, 2000. *Э.А.Вальчук.*

САНІТА́РНЫ РАЗРЫ́Ў, тое, што *санітарна-ахоўная зона*.

САНІТАРЫ́І ГІГІЁНЫ НДІ Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1927 у Мінску як Бел. санітарна-гігіенічны ін-т. З 1933 Ін-т сацыялістычнай аховы здароўя і гігіены, з 1963 Бел. н.-д. санітарна-гігіенічны ін-т, з 2000 сучасная назва. Аспірантура з 1999. Асн. кірункі навук. дзейнасці: распрацоўка мерапрыемстваў і гігіенічных рэгламентаў па прафілактыцы захворванняў і захавання здароўя насельніцтва на аснове вывучэння асаблівасцей і механізмаў уплыву хім., фіз. і біял. фактараў асяроддзя пражывання чалавека; абгрунтаванне мер па гігіен. рэгламентацыі шкодных вытв. фактараў, аптымізацыі ўмоў і характару працы, прафілактыцы, дыягностыцы і лячэнні вытворча абумоўленых і прафес. захворванняў; вывучэнне этыялогіі і патагенезу захворванняў, абумоўленых уздзеяннем навакольнага асяроддзя; вывучэнне фактычнага і статусу харчавання насельніцтва, распрацоўка гігіенічных рэкамендацый і нарматыўных дакументаў па аптымізацыі харчавання; таксікалага-гігіенічныя даследаванні прадуктаў харчавання, харч. дабавак і матэрыялаў, якія кантактуюць з харч. прадуктамі; медыка-біял. абгрунтаванне шляхоў павышэння харч. і біял. каштоўнасці прадуктаў харчавання; вывучэнне адаптацыйных і псіхафізіял. магчымасцей арганізма дзяцей і падлеткаў для распрацоўкі гігіенічных мерапрыемстваў і нарматыўных палажэнняў удасканалення ўмоў іх навучання і выхавання і інш. У 2000 г. на базе ін-та створаны Нац. цэнтр міжнар. форуму па хім. бяспецы.

САНІТА́РЫЯ (ад лац. sanitas здароўе), практычныя мерапрыемствы, накіраваныя на аздараўленне жыцця, працы і адпачынку насельніцтва. Тэарэт. асновы С. і сан. нарматывы распрацоўвае *гігіена*. Падзяляецца на жыллёва-камунальную (сан. добраўпарадкаванне нас. месцаў, жылых і грамадскіх будынкаў) і

вытв. (прадухіленне або памяншэнне ўздзеяння на працуючых шкодных вытв. фактараў). Правядзенне сан. мерапрыемстваў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб санітарна-эпідэміялагічным дабрабыце насельніцтва» (2000). Кантроль за правядзеннем сан. і процізпідэмічных мерапрыемстваў ажыццяўляе *санітарна-эпідэміялагічная служба.* *М.В.Шчавелева.*

«САН-КА́РЛА» (Teatro San Carlo), тэатр оперы і балета ў г. Неапаль (Італія). Адкрыты ў 1737. Будынак пабудаваны па праекце архітэктараў Дж.А.Медрана і А.Карасале. У 18 ст. ставіліся оперы Л.Леа, І.Гасе, К.В.Глюка, Дж.Паізіела, Д.Чымарозы і інш. У 19 ст. прайшлі прэм'еры некат. опер Дж.Расіні, Г.Данізэці, Дж.Вердзі, Ж.Бізэ, Ш.Гуно, Дж.Меербера, Р.Вагнера і інш. У 20 ст. вял. месца ў рэпертуары займалі творы кампазітараў Італіі І.Піцэці, Р.Дзанданаі, Ф.Альфана і інш., творы замежных кампазітараў Р.Штрауса, А.Анегера, І.Стравінскага. У т-ры выступалі вядомыя спевакі І.Кольбран, М.Гарсія, Д.Данцэлі, А.Паці, Б.Джылы, Г.Пазера, П.Дамінга, М.Кабалье, Р.Кабайванская, Л.Паваротці, І.Архіпава і інш.; салісты балета Ф.Чэрыта, К.Грызі, Л. дэ Ларэнца, А.Вісконці, М.Бардзін, Э.Мацукелі, В.Нардзі і інш. Сярод дырыжораў т-ра Дж.Патане, Ж.Прэтр, Дж.Прытчард, М.Росі, К.Франчы і інш.

САН-КАЭТА́НУ-ДУ-СУЛ (São Caetano do Sul), горад на ПдУ Бразіліі, прамысл. спадарожнік г. Сан-Паўлу. Засн. ў 1631. Каля 200 тыс. ж. (2000). Трансп. вузел. Прам-сць: аўтамабільная (зборка), металургічная, хім., буд. матэрыялаў.

САНКО́ЎСКАЯ Кацярына Аляксандраўна (23.11.1816, Масква — 28.8.1878), руская артыстка балета. Першая танцоўшчыца маскоўскай сцэны, якая засвоіла прарамант. і лірыка-рамант. стылі зах.-еўрап. балета і надала ім нац. афарбоўку. Скончыла Маскоўскае тэатр. вучылішча (1836, кл. Ф.Гюлень-Сор), вучылася драм. мастацтву ў М.Шчэпкіна. З 1826 у балетных і драм. спектаклях у Малым т-ры ў Маскве. З 1835 у трупе Вял. т-ра (у 1836 стажыравалася ў Парыжы). У 1846 гастраліравала за мяжой.

З 1854 выкладала бальныя танцы ў гімназіі, давала прыватныя ўрокі, у т.л. ў сям'і К.Станіслаўскага. Творчасці С. уласцівы рамант. накіраванасць, маст. дасканаласць формы, незвычайная лёгкасць і натуральная грацыёзнасць выканання. Сярод лепшых партый: Сільфіда («Сільфіда» Ж.Шнейцгофера), Флёр дэ Шан, Жызэль («Дзева Дуная», «Жызэль» А.Адана), Катарына, Эсмеральда («Катарына, дачка рабаўніка», «Эсмеральда» Ц.Пуні) і інш. Паставіла балеты «Наравістая жонка» («Сумбуршчыца») Адана (1846), «Мара мастака» Пуні (1849).

С.В.Гуткоўская.

САНКО́ЎСКІ Ф., бел. архітэктар 2-й пал. 18 — пач. 19 ст.; прадстаўнік класіцызму. У пач. 19 ст. віцебскі губернскі архітэктар. Аўтар праектаў адм. будынкаў у Віцебску, Козьмадзям'янаўскай царквы ў в. Гарадок Віцебскай вобл. (1808), выканаў праект і кіраваў перабудовай дома Кудзіновічаў пад *Віцебскі палац губернатара.* *В.Ф.Марозаў.*

САН-КРЫСТО́БАЛЬ (San Cristóbal), горад на З Венесуэлы, каля граніцы з Калумбіяй. Адм. ц. штата Тачыра. Засн. ў 1561. Каля 400 тыс. ж. (2000). На адгалінаванні Панамерыканскай шашы, вузел аўтадарог. Аэрапорт. Цэнтр с.-г. раёна, найважнейшага ў краіне па зборы кавы. Прам-сць: цэм., тэкст., гарбарна-абутковая, харчасмакавая. 2 ун-ты.

САНКТ-МО́РЫЦ (Sankt Moritz), бальнеалагічны і горналыжны курорт у Швейцарыі. Размешчаны ў даліне р. Ін на выш. 1856 м, на беразе воз. Санкт-Морыц (адсюль назва). Асн. прыродны лек. фактар — мінер. крыніцы жалезістай вады. Лечаць захворванні органаў дыхання, руху і апоры, стрававання і інш. Мін. вада ўжываецца на пітное лячэнне, мінер. ванны. Атэлі, пітная галерэя, курортны парк. Буйны цэнтр турызму і зімовых відаў спорту (зімовыя Алімп. гульні 1928 і 1948).

«САНКТ-ПЕТЕРБУ́РГСКИЕ ВЕ́ДОМОСТИ», газета. Выдавалася ў 1728—1917 у Пецярбургу як працяг першай рус. газеты *«Ведомости»* (з 1914 выходзіла пад назвай «Петроградские ведомости»). Да 1874 выдавалася пры АН, з 1875 пры Мін-ве нар. асветы. Сярод рэдактараў М.В.Ламаносаў (1748—65). Асвятляла ўнутр. і знешнія паліт. падзеі, навуку, мастацтва, прам-сць, гандаль і інш. Выдавала дадатак «Месячные исторические, генеалогические и географические примечания в Ведомостях» (1728—42, першы рус. часопіс, назва мянялася).

САНКТ-ПЕЦЯРБУ́РГ, горад федэральнага значэння, горад-герой, цэнтр Ленінградскай вобл. ў Расіі. Найважнейшы (пасля Масквы) прамысл., навук. і культ. цэнтр Расіі. Размешчаны пры ўпадзенні р. Нява ў Фінскі зал. Балтыйскага м. і на 42 а-вах дэльты р. Нява. Нас. 4694 тыс. ж. (2000). Буйны трансп. вузел (чыгункі, шашэйныя дарогі). Міжнар. аэрапорт (Пулкава). Марскі (у Фінскім зал.) і рачны (у дэльце р. Нява) парты; канечны пункт Волга-Балт. воднага шляху. Метрапалітэн (з 1955). Прам-сць: маш.-буд. і металаапр. (марскія і рачныя судны, турбіны ўсіх відаў, дызельныя рухавікі, радыёэлектронная і радыётэхн. прадукцыя, станкі, машыны і абсталяванне для трыкат., абутковай, тытунёвай, паліграф. і інш. галін), харч. і харчасмакавая, эл.-энергетычная (АЭС і буйныя ЦЭС), хім., нафтахім., хім.-фармацэўтычная, лясная, дрэваапрацоўчая і папяровая, лёгкая (тэкст., трыкат., абутковая, швейная) і паліграфічная. Чорная і каляровая металургія (вытв-сць сталі, пракату, алюм. сплаваў) і інш. Буйны турыстычны цэнтр Расіі, штогод прыцягвае вял. колькасць турыстаў з усяго свету.

Паводле загаду Пятра I на в-ве Заечым у вусці Нявы 27.5.1703 (лічыцца датай засн. горада) пачалося будаўніцтва *Петрапаўлаўскай крэпасці.* З 1708 С.-П. — цэнтр Інгерманландскай, з 1710 — Санкт-Пецярбургскай губ. У 1712—28 і 1732—1918 сталіца Расіі. Тут размяшчаліся царскі двор, калегіі (з 1718; з 1802 — міністэрствы), Сенат (з 1713) і інш. ўрадавыя ўстановы. Новы горад развіваўся як цэнтр прамысловасці і гандлю. У 1712 на Адміралцейскім в-ве засн. Галерны двор (з 1800 Новае Адміралцейства), у 1711 Ліцейны двор (з 1720 наз. Арсенал), у 1724 Манетны двор і інш. У 1736 і 1737 горад моцна гарэў. З 2-й пал. 18 ст. хутка расло насельніцтва С.-П. (220 тыс. чал. у пач. 19 ст.), горад стаў буйным эканам. і культ. цэнтрам Рас. імперыі. Засн. Марская акадэмія (1715), АН (1725), ун-т (1819), Тэхнал. (1828) і Горны (1866) ін-ты і інш. У 1825 на Сенацкай плошчы адбылося паўстанне *дзекабрыстаў.* У 2-й пал. 18 — 1-й пал. 19 ст. развівалася тэкстыльная, суднабуд., машынабуд. прам-сць, пабудаваны з-ды Адміралцейскі, Ижорскі, Пуцілаўскі, Марыінская і Ціхвінская водныя сістэмы. Пабудова чыгункі ператварыла С.-П. у найбуйн. эканам. цэнтр краіны (у 1837 пабудавана першая ў Расіі чыг. С.-П. — Масква, у 2-й пал. 19 ст. — Варшаўская, Паўн. і Фінляндская). У 1883 пабудавана першая эл.-станцыя, у 1907 пушчаны першыя трамваі і аўтобусы. У канцы 19 ст. С.-П. стаў буйнейшым у Расіі і адным з важнейшых сусв. крэдытных і біржавых цэнтраў. У С.-П. дзейнічалі рэв. арг-цыі *петрашэўцаў, «Народная воля», Пецярбургскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа».* У 1901 у С.-П. адбылося першае ў Расіі арганізаванае выступленне рабочых — Абухаўская абарона. 9.1.1905 царскія войскі расстралялі рабочую дэманстрацыю (гл. *«Крывавая нядзеля»*), што стала пачаткам *Рэвалюцыі 1905—07* у Расіі. У 1914 у пач. 1-й сусв. вайны горад перайменаваны ў Петраград. Тут адбыліся *Лютаўская рэвалюцыя 1917* і *Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917.* Вясной — восенню 1919 на горад беспаспяхова наступалі войскі Юдзеніча. Каля Петраграда адбылося *Кранштацкае паўстанне 1921.* У 1924 перайменаваны ў Ленінград. У Вял. Айч. вайну ў вер. 1941 горад акружаны ням.-фаш. войскамі (гл. *Ленінградская бітва 1941—44*). У ходзе 872-дзённай блакады разбурана 14 тыс. будынкаў, ад голаду загінула да 900 тыс. чал. У студз. 1944 вызвалены ад блакады сав. войскамі. У 1991 гораду вернута яго гіст. назва С.-П.

С.-П. забудоўваўся паводле рэгулярнага плана. Арганізуючым пачаткам горада сталі водная прастора Нявы і ансамбль Петрапаўлаўскай крэпасці. У 1704 закладзены будынак гал. *Адміралцейства*, ад якога веерам разыходзіліся 3 гал. магістралі: Неўскі і Вазнясенскі праспекты, Гарохавая вул. На Васільеўскім в-ве ўзведзены палац Меншыкава (1710—16, арх. Дж.М.Фантана і Г.Шэдэль), Кунсткамера (1718—34, арх. Г.Матарнові, Н.Гербель, Г.К'яверы, М.Зямцоў; перабудавана ў 1754—58, арх. С.Чавакінскі), будынак 12 калегій (1722—42, арх. Д.Трэзіні, Т.Швертфегер; з 1819 ун-т). У 1717 складзены план цэнтра горада з прамавугольнай сеткай вуліц і каналаў (арх. Трэзіні). Створаны «ўзорныя» праекты жылых будынкаў (арх. Ж.Б.А.Леблон, Трэзіні): цагляных — для заможных, на драўляным каркасе з запаўненнем глінай, з размалёўкай пад цэглу — для простых гараджан. У 1710 засн. манастыр св. Тройцы і св. Аляксандра Неўскага (з 1797 — *Аляксандра-Неўская лаўра*). У 1710—14 у *Летнім садзе* ўзведзены летні палац Пятра I (арх. Трэзіні). У сярэдзіне 18 ст. пашырана параднае буд-ва ў стылі барока: ансамбль *Смольнага манастыра, Зімні палац*, палацы

Варанцова (1749—57, арх. В.Растрэлі), Шарамецева на Фантанцы (1750—55, арх. Чавакінскі, Ф.Аргуноў), Строганава (1752—54, арх. Растрэлі; цяпер адзін з будынкаў *Рускага музея*), Нікольскі марскі сабор (1753—62, арх. Чавакінскі). Паводле генплана 1763—69 (арх. А.Квасаў) межы горада пашыраны, перапланаваны вуліцы, пабудавана першая гранітная набярэжная перад Зімнім палацам на Няве (1763—67, арх. І.Росі, майстар Г.Насонаў). Ансамблевасцю вылучаецца афармленне набярэжных Кацярынінскага (цяпер Грыбаедава) канала, рэк Фантанкі і Мойкі. Рысы класіцызму выявіліся ў строгай лінейнасці берагавых сцен і парапетаў, мяккай акругленасці спускаў і прычалаў, сілуэтах першых каменных мастоў (Прачачны, Эрмітажны і інш.), у малюнку чыг. агароджаў (агароджа Летняга сада, 1773—84, арх. Ю.Фельтэн, П.Ягораў). Сярод помнікаў ранняга класіцызму ў спалучэнні з барочнай пластыкай: Гасціны двор на Неўскім праспекце (1761—85) і будынак Акадэміі мастацтваў (1764—88, арх. абодвух Ж.Б.М.Вален-Дэламот і А.Какорынаў), Малы Эрмітаж (1764—67, арх. Вален-Дэламот). Грамадскія будынкі канца 18 — пач. 19 ст. набылі большую лапідарнасць, уласцівую класіцызму: паштамт (1782—89, арх. М.Львоў), Эрмітажны т-р (1783—87, арх. Дж.Кварэнгі), Коннагвардзейскі манеж (1804—07, арх. Кварэнгі; цяпер Цэнтр. выставачная зала), Аляксандрынскі т-р (1828—32, арх. К.Росі). У 1783—89 узведзены *Таўрычаскі палац*. Вакол вял. воднай плошчы пры падзеле Нявы на рукавы створаны грандыёзныя класіцыстычныя ансамблі: *Дварцовая плошча* з Зімнім палацам, Аляксандраўскай калонай і аркай Ген. штаба, стрэлка Васілеўскага в-ва з будынкам біржы (1805—10, арх. Ж.Тама дэ Тамон; цяпер Цэнтр. ваен.-марскі музей; ампір), Сенацкая пл. (цяпер Дзекабрыстаў) з помнікам Пятру I («Медны коннік»; 1768—78, скульпт. Э.М.Фальканэ, М.А.Кало, Ф.Гардзееў), *Ісакіеўскі сабор*; ансамблі Неўскага праспекта (*Казанскі сабор*, плошчы Астроўскага і Мастацтваў), *Марсава поле*, Летні сад, Інжынерны замак (да 1823 Міхайлаўскі замак; 1797—1800, арх. В.Бажэнаў, В.Брэна), Ісакіеўская пл. Ствараліся і загарадныя ансамблі — Аляксандра-Неўская лаўра, Смольны ін-т, арх.-паркавы Ялагіна в-ва з Ялагіным палацам (1818—22, праспекце (1910-я г., арх. Л. і Ю.Бенуа, У.Шчуко, С.Мінаш). Вылучаюцца асабнякі ў стылі неакласіцызму — Полаўцава (1910—16), Абамелек-Лазарава (1913—15, арх. абодвух І.Фамін). Паводле генпланаў 1930—40-х г. захавалася існуючая планіроўка цэнтра, створаны новыя раёны на свабодных тэрыторыях: Малая Охта, Шчамілаўка, Аўтава і інш. Узведзены буйныя адм. будынкі. С.-П. моцна пацярпеў у Вял. Айч. вайну. У генпланах аднаўлення і развіцця горада (1940—60-я г.) комплексна вырашаліся задачы рэканструкцыі і новага буд-ва. Адна з гал. горадабуд. ідэй генпланаў — выхад гар. забудовы да берагоў Фін. заліва. Ствараюцца новая марская панарама горада, зона адпачынку з добраўпарадкаванымі набярэжнымі, пляжамі, бульварамі, паркамі (Прыморскі парк Перамогі, 1945—50, арх. А.Нікольскі, Н.Сцяпанаў, Н.Мядзведзеў) са стадыёнам (1932—50, арх. Нікольскі, М.Сцяпанаў; рэканструяваны ў 1980, арх. А.Прыбульскі, С.Аднавалаў, М.Цымбал). Сярод значных збудаванняў 2-й пал. 20 ст.: Вял. канцэртная зала «Кастрычніцкая» (1967, арх. В.Каменскі і інш.), палацы спорту «Юбілейны» (1967, арх. Г.Марозаў, інж. А.Марозаў і інш.), моладзі (1969—80, арх. П.Прохараў і

Санкт-Пецярбург. Від на раку Фантанка.

Санкт-Пецярбург. Помнік Пятру I («Медны коннік»). 1768—78.

Санкт-Пецярбург. Царква Уваскрэсення Хрыста Збавіцеля («Храм на крыві»). 1883—1907.

арх. Росі) і пейзажным паркам. У стылі ампір пабудаваны: Горны ін-т (1806, арх. А.Вараніхін), Адміралцейства, Нарвенскія вароты (1827—34, арх. Кварэнгі, В.Стасаў) з манум. меднай каляскай (скульпт. П.Клот, С.Піменаў) і інш. Сярод эклектычных збудаванняў: цэрквы лютэранская Пятра і Паўла на Неўскім праспекце (1832—38, арх. А.Брулоў), Уваскрэсення Хрыста Збавіцеля («Храм на крыві»; 1883—1907, арх. В.Малышаў, А.Парланд; мазаікі В.Васняцова; маст. М.Несцераў, А.Рабушкін), Марыінскі т-р (1859—60, арх. А.Кавас; перабудова 1863, арх. В.Шротэр). У 19 ст. пабудаваны шматлікія масты — цераз Няву (Троіцкі, цяпер Кіраўскі, арх. Л.Бенуа, А.Памяранцаў і інш.), Мойку (Зялёны, Красны, Сіні, Пацалункаў, арх. В.Гестэ), канал Грыбаедава (ланцуговыя Банкаўскі і Львіны, інж. Г.Трэтэр; чыг. грыфоны і львы па мадэлях П.Сакалова), Фантанку (Анічкаў, інж. І.Бутац, арх. Брулоў; бронз. групы ўтаймавальнікаў коней, скульпт. Клот). Усяго ў С.-П. каля 800 мастоў. У 19 — пач. 20 ст. створаны гранітныя набярэжныя Нявы. Паявіліся будынкі новых тыпаў — даходныя дамы, вакзалы, банкі, гасцініцы, страхавыя канторы, крытыя рынкі. Пашырыўся стыль мадэрн: Дом кнігі (1904—06, арх. П.Сюзор), Азоўска-Данскі камерцыйны банк (1907—13), гасцініца «Асторыя» (1910—11, арх. абодвух Ф.Лідваль), пасаж на Ліцейным праспекце (1912—13, арх. Н.Васільеў), даходныя дамы на Кіраўскім інш.), спарт. гульняў (1974—76, арх. Г.Марозаў), спарт.-канцэртны комплекс (1980, арх. І.Чайко і інш.), гасцініца «Пулкаўская» (1981, арх. С.Спяранскі і інш.), лядовы Палац спорту (2000). Створаны мемар. комплекс *Піскароўскіх могілак*, Манумент гераічным абаронцам Ленінграда ў Вял. Айч. вайну (1975, арх. Спяранскі, Каменскі, скульпт. М.Анікушын). Па лініі абароны горада зроблены «Зялёны пояс Славы». Гіст. цэнтр і манум. ансамблі С.-П. ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

У С.-П. знаходзяцца навук. цэнтр Рас. АН, больш за 40 ВНУ, у т.л. *Санкт-Пецярбургскі універсітэт*, ун-ты — тэхнічны, Рас. пед. імя А.Герцэна, лесатэхнічная акадэмія; *Санкт-Пецярбургская кансерваторыя*; інстытуты — тэхналагічны, горны, інж.-будаўнічы, інжынераў чыг. транспарту, караблебуд., Санкт-Пецярбургскі інстытут кінаінжынераў, Санкт-Пецярбургскі інстытут тэатра, музыкі і кінематаграфіі, *Санкт-Пецярбургскі інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры* імя І.Я.Рэпіна, *Санкт-Пецярбургскае вышэйшае мастацкапрамысловае вучылішча* імя В.І.Мухінай; 22 вышэйшыя ваенна-навуч. ўстановы, у т.л. Ваенна-мед. акадэмія. Найбуйнейшыя б-кі: Рас. нац., навуковая Акадэміі мастацтваў, С.-Пецярбургскага ун-та, Рас. АН і інш. Больш за 120 музеяў і іх філіялаў, у т.л. *Эрмітаж, Рускі музей*, гісторыі С.-П., антрапалогіі і этнаграфіі імя Пятра Вялікага, Цэнтр. ваенна-марскі.

18 прафес. тэатраў, у т.л. *Марыінскі тэатр, Санкт-Пецярбургскі Малы тэатр оперы і балета*, драмы імя Пушкіна (Александрынскі), *Санкт-Пецярбургскі Вялікі драматычны тэатр*. Цырк. Філармонія імя Дз.Шастаковіча.

Беларусы ў Санкт-Пецярбургу. Першыя выхадцы з Беларусі з'явіліся ў С.-П. пасля заснавання горада (жонка Пятра I *Кацярына I*, паплечнік цара П.І.*Ягужынскі*, ваен. і дзярж. дзеяч Я.К.*Сапега*). Пасля далучэння бел. зямель да Расіі некат. беларусы сталі прыбываць у С.-П. для працаўладкавання, вучобы, маст. творчасці; яны садзейнічалі знаёмству рас. сталіцы з дасягненнямі еўрап. культуры (Л.Сітанскі, частка салістаў *Шклоўскага тэатра Зорыча* і інш.). У 1-й пал. 19 ст. ў С.-П. пачала гуртавацца бел. студэнцкая моладзь, там жылі і працавалі кампазітар А.І.*Абрамовіч*, мастак І.І.*Аляшкевіч*, літаратар Я.*Баршчэўскі*. Пасля паражэння паўстання 1830—31 у С.-П. трапілі музейныя зборы, б-кі і архівы роду *Сапегаў*. У 1842—1918 у Пецярбургскай рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі рыхтавалі святароў, у т.л. для касцёлаў і дыяцэзій Беларусі. У 2-й пал. 19 ст. ў горадзе вучыліся браты В.*Каліноўскі* і К.*Каліноўскі*, Ф.*Багушэвіч*, працавалі філолаг-фалькларыст Б.*Эпімах-Шыпіла*, гідрограф-геадэзіст А.І.*Вількіцкі*, гісторык Я.Я.*Замыслоўскі*, мастакі С.К.*Заранка*, К.*Хруцкі*, музыканты Т.*Юзафовіч-Бароўская*, М.І.*Зарэмба*, Ф.І.*Стравінскі* і інш., дзейнічалі бел. асветнае т-ва «*Крывіцкі вязок*» (заснавальнік і кіраўнік В.*Савіч-Заблоцкі*), рэв. група «*Гоман*» (выдавала нелегальны час. «*Гомон*»), бел. фракцыя партыі «*Народная воля*», у т.л. І.Грынявіцкі, *Пецярбургскі гурток моладзі польска-літоўска-беларускай і маларускай*, у т.л. яе кіраўнік паэт А.*Гурыновіч*. Паводле перапісу 1897, у С.-П. і прыгарадах жыло 3230 чал., якія лічылі роднай бел. мову, а па падліках бел. даследчыка Р.М.*Семашкевіча*, у канцы 19 ст. тут жыло каля 7 тыс. беларусаў. У пач. 20 ст. тут часова жылі літаратары Ц.*Гартны* (З.Жылуновіч), А.*Гурло*, Я.*Купала*, *Цётка* (А.Пашкевіч), вучоныя Я.Ф.*Карскі*, П.В.*Шэйн* і інш., дзейнічалі грамадская арг-цыя «*Круг беларускай народнай прасветы і культуры*» (1902—04), нелегальнае бел. выдавецкае т-ва «*Грамада*» (1906—07), першае легальнае бел. выд-ва «*Загляне сонца і ў наша аконца*» (1906—14), прыватнае бел. *Ірыневіча выдавецтва* (1910—13), *Беларускі навукова-літаратурны гурток* студэнтаў С.-Пецярбургскага ун-та (1912—14), ладзіліся бел. канцэрты і тэатр. спектаклі (гастролі трупы І.*Буйніцкага* ў 1911, пастаноўка п'есы Я.Купалы «Паўлінка» 9.2.1913). У 1-ю сусв. вайну ў С.-П. і яго наваколлі асела частка бежанцаў з Беларусі, якім дапамагала дабрачыннае *Беларускае таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны* (1916—18); выдавалася газ. «*Дзянніца*» (1916—17). У 1917—20 тут вялі актыўную рэв., грамадска-паліт. і культ. дзейнасць арг-цыі *Беларускай сацыялістычнай грамады*, *Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі*, *Беларускія секцыі РКП(б)*, *Беларускі абласны камітэт* пры Усерас. савеце сял. дэпутатаў (старшыня Я.С.*Канчар*), *Беларускі нацыянальны камісаріят* (камісар А.Р.*Чарвякоў*), клуб «*Беларуская хатка*», *Беларускае вольна-эканамічнае таварыства*, *Таварыства ахвотнікаў беларускага народнага штукарства*; друкаваліся часопісы «*Белорусская криница*», «*Чырвоны шлях*», газ. «Дзянніца», сфарміраваны *Першы беларускі камуністычны атрад*. У 1923—25 існавала *Асацыяцыя беларускіх студэнтаў* ВНУ у Петраградзе, а потым яе пераемнік — Бел. студэнцкае земляцтва ў Ленінградзе (1925—37). У горадзе жылі і працавалі музыказнавец І.І.*Салярынскі*, пісьменнік Л.І.Ракоўскі, вучоныя Б.Р.*Галёркін*, С.Я.*Лур'е*, У.Ф.*Міткевіч*, П.Ф.*Папковіч*, Л.У.*Шчэрба*, служылі контр-адміралы В.П.*Дрозд*, М.Б.*Лаўлавіч*, ген.-лейт. Ф.Н.*Шульгоўскі* і інш. выхадцы з Беларусі. Да канца 1980-х г. у С.-П. і Ленінградскай вобл. склаўся адзін з найбуйнейшых і кампактных бел. асяродкаў у Расіі (больш за 127 тыс. чал.). У выніку карэнных грамадска-паліт. зрухаў у СССР у горадзе адрадзілася нац.-культ. дзейнасць мясц. беларусаў, згорнутая пад ціскам сав. улад у 1930-я г. У 1989 засн. *Беларускае грамадска-культурнае таварыства*, якое мае філіял Т-ва бел. мовы імя Ф.Скарыны (старшыня А.Мыльнікаў) і рэгіянальную суполку Міжнар. асацыяцыі беларусістаў (старшыня В.П.*Грыцкевіч*), удзельнічае ў навук. канферэнцыях «Санкт-Пецярбург і беларуская культура» (у 1993—2001 адбылося 9 канферэнцый), з'ездах і сходах беларусаў замежжа, вядзецца бел. выдавецкая дзейнасць. Мастакі Ю.Казак, В.Сівуха і інш. ўваходзяць у творчае аб'яднанне краін Балтыі «*Маю гонар*». Бел.-рас. культ. сувязі даследуюць Грыцкевіч, М.В.*Нікалаеў* і інш., ваен. сувязі — І.Я.Краўцоў. З С.-П. звязана навук. дзейнасць ураджэнца Беларусі, лаўрэата Нобелеўскай прэміі 2000 па фізіцы Ж.І.*Алфёрава*.

Літ.: Очерки истории Ленинграда. Т. 1—7. М.; Л., 1955—89; Засосов Д.А., Пызин В.И. Из жизни Петербурга 1890—1910-х гг.: Зап. очевидцев. Л., 1991; Санкт-Петербург. Петроград. Ленинград: Энцикл. справ. М., 1992; Ленинград: Архит. ансамбли и памятники. 3 изд. Л. 1980; Захаров О.Н. Архитектурные панорамы невских берегов. Л., 1984; Бунин М.С. Мосты Ленинграда. Л., 1986; Пунин А.Л. Архитектура Петербурга середины XIX в. Л., 1990; Семашкевіч Р.М. Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе (канец XIX — пачатак XX ст.). Мн., 1971; Грыцкевіч В. Пяць гадоў дзейнасці Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Пецярбургу // Беларусіка-Albaruthenica. Мн., 1995. Кн. 5; Белорусский сборник: Статьи и материалы по истории и культуре Белоруссии. Вып. 1. СПб., 1998; Ленинградский мартиролог, 1937—1938. Т. 1—5. СПб., 1995—2001; Хто ёсць Хто сярод беларусаў свету: Энцыкл. даведн. Ч. 1. Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў замежных краінах. Мн., 2000.

Л.У.Языковіч (беларусы ў Санкт-Пецярбургу).

Санкт-Пецярбург. Ісакіеўская плошча з помнікам Мікалаю I.

Санкт-Пецярбург. Стрэлка Васілеўскага вострава. Злева — будынак біржы.

САНКТ-ПЕЦЯРБУ́РГСКАЕ ВЫШЭ́ЙШАЕ МАСТА́ЦКА-ПРАМЫСЛО́ВАЕ ВУЧЫ́ЛІШЧА

імя В.І.Мухінай, адна са старэйшых вышэйшых маст. навучальных устаноў Расіі. Засн. ў 1876 у Пецярбургу як Цэнтр. вучылішча тэхн. малявання барона А.Л.Штыгліца. У 1922 уведзена ў склад петраградскага Вышэйшага тэхн.-маст. ін-та. У 1945 адноўлена як Ленінградскае маст.-прамысл. вучылішча, з 1948 ВНУ, з 1953 імя Мухінай, з 1994 сучасная назва. Рыхтуе мастакоў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасцях: дэкар.-прыкладное мастацтва, маст. афармленне і мадэліраванне вырабаў, інтэр'ер і абсталяванне, прамысл. мастацтва, манум.-дэкар. мастацтва, а таксама выкладчыкаў малявання і дэкар.-прыкладнога мастацтва для маст.-прамысл. школ. Мае ф-ты манум., дэкар.-прыкладнога і прыкладнога мастацтваў; аспірантуру. Створаны музей дэкар.-прыкладнога мастацтва. У розныя часы ў вучылішчы выкладалі П.Бучкін, С.Васількоўскі, Р.Фрэнц, Г.Савіна. Вучылішча скончылі бел. мастакі М.Кірылаў, У.Мурахвер, Л.Мягкова, М.Міхалап,

А.Някрасаў, С.Палякоў, Л.Панамарэнка, У.Пракоф'еў, М.Рыжанкоў, А.Салаўёў, І.Харламаў і інш.

САНКТ-ПЕЦЯРБУ́РГСКАЯ АКАДЭМІ́ЧНАЯ КАПЭ́ЛА імя М.І.Глінкі, старэйшы рус. харавы прафес. калектыў. Бярэ пачатак ад заснавання ў 1479 у Маскве мужчынскага хору (т. зв. гасударавых пеўчых дзякаў, з 17 ст. ў ім спявалі і хлопчыкі), з 1703 у Пецярбургу, з 1763 — імператарская Прыдворная пеўчая капэла, з 1918 — Нар. акадэмія, з 1922 — Дзярж. акад. капэла, з 1954 — Ленінградская акад. капэла імя Глінкі, з 1992 — сучасная назва. У 1740—1844 пры капэле перыядычна працавалі інстр., з 1846 — дырыжорскія (рэгенцкія) класы, з 1858 — муз. школа, з 1922 — харавы тэхнікум, з 1945 — харавое вучылішча, з 1955 самаст. ўстанова. Як цэнтр рус. харавой культуры ўздзейнічала на фарміраванне традыцый хар. выканальніцтва і на стыль хар. пісьма без суправаджэння (a capella). У канцы 19 ст. — замкнуты царкоўны хор. З 1920 у складзе хору і жаночыя галасы. Акрамя культавай музыкі ў яе рэпертуары лепшыя творы кантатна-аратарыяльнага жанру кампазітараў 17—19 ст., класічныя і сучасныя хоры a capella, апрацоўкі нар. песень, кантаты, араторыі. Капэлай кіравалі: М.Палтарацкі (1763—95), Дз.Бартнянскі (1796—1825), Ф.П.Львоў (1825—36), А.Ф.Львоў (1837—61), М.Бахмецеў (1861—83), М.Балакіраў (1883—94), А.Арэнскі (1895—90), С.Смаленскі (1901—03), А.Шарамецеў (1904—17). У 1837—39 у ёй працаваў Глінка, у 1883—94 — М.Рымскі-Корсакаў. Вядучую ролю ў яе перабудове адыграў дырыжор М.Клімаў (1917—35). Сярод інш. дырыжораў М.Данілін (1936—37), А.Свешнікаў (1937—41), Л.Кудраўцава (1941—43), А.Анісімаў (1955—65), У.Мінін (1965—67), Ф.Казлоў (1967—72), А.Міхайлаў (1972—74), У.Чарнушэнка (з 1974). У праграме капэлы класіка і творы рус. кампазітараў (20 ст.), у т.л. Г.Свірыдава, В.Салманава, Р.Шчадрына, А.Фляркоўскага, С.Сланімскага і інш. У 1981 капэлай праведзены фестываль «Неўскія асамблеі», які складаўся з цыкла гіст. канцэртаў «Пяць вякоў рускай харавой музыкі».

Літ.: Ершов А. Старейший русский хор Ленинградской государственной академической капеллы им. М.И.Глинки, 1703—1978. Л., 1973; Певческая капелла С.-Петербурга: [Альбом]. СПб., 1994. *Л.А.Шымановіч.*

САНКТ-ПЕЦЯРБУ́РГСКАЯ КАНСЕРВАТО́РЫЯ імя М.А.Рымскага-Корсакава, першая вышэйшая муз. навуч. ўстанова Расіі. Засн. ў 1862 у Пецярбургу Рас. муз. т-вам па ініцыятыве А.*Рубінштэйна*. З 1918 дзярж. навуч. ўстанова, з 1944 імя Рымскага-Корсакава. У 1923 пры ёй адкрыта Оперная студыя, у 1925 — аддз. па падрыхтоўцы навук. работнікаў, педагогаў для спец. навуч. устаноў, дырыжорскае аддз., оперна-рэжысёрскі клас, аспірантура, у 1934 — Муз. тэхнікум (цяпер — самаст. навуч. ўстанова). У ёй выкладалі Л.Аўэр, А.Вержбіловіч, К.Давыдаў, Г.Есіпава, Ф.Лешаціцкі, Г.Нісен-Саламан, Рымскі-Корсакаў, К.Эверардзі і інш. Сярод выхаванцаў: А.Абразцова, М.Анцаў, А.Арэнскі, Э.Бай, М.Дубасаў, М.Іпалітаў-Іванаў, А.Лядаў, М.Малько, А.Мелік-Пашаеў, Я.Мравінскі, Н.Мураńская, М.Мяскоўскі, С.Пракоф'еў, К.Пушылаў, М.Рубінштэйн, В.Салаўёў-Сядой, У.Сафраніцкі, Г.Свірыдаў, П.Чайкоўскі, Ю.Шапорын, Дз.Шастаковіч, Е.Шуман і інш. У кансерваторыі атрымалі адукацыю бел. кампазітары В.Капыцько, У.Палуэктаў, удасканальвалі майстэрства кампазітары І.Лучанок, Я.Паплаўскі, Р.Сурус, Л.Шлег, піяністы М.Бергер, Р.Шаршэўскі; скрыпач А.Бяссмертны і інш. Мае Вял. залу для оперных спектакляў і сімф. канцэртаў, Малую залу (з арганам) для правядзення сольных і камерных канцэртаў. У 2000/01 навуч. г. ф-ты: фартэпіянны, аркестравы, вак.-рэжысёрскі, дырыжорскі, нар. інструментаў, кампазітарскі, гіст.-тэарэтычны. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае.

Літ.: Кремлев Ю. Ленинградская государственная консерватория, 1862—1937. М., 1938; 100 лет Ленинградской консерватории, 1862—1962: Ист. очерк. Л., 1962; Масленікава В.П. Музычная адукацыя ў Беларусі. Мн., 1980. *В.П.Пракапцова.*

САНКТ-ПЕЦЯРБУ́РГСКІ АКАДЭМІ́ЧНЫ СІМФАНІ́ЧНЫ АРКЕ́СТР Санкт-Пецярбургскай філармоніі імя Дз.Шастаковіча, старэйшы ў Расіі сімф. аркестр. Засл. калектыў Расіі (1934). Засн. ў 1882 як Прыдворны музыканцкі хор у Пецярбургу (з 1897 Прыдворны аркестр, які складаўся з 2 аркестраў: сімф. і духавога). З 1917 Дзярж. сімф. аркестр, з 1921 у складзе С.-Пецярбургскай філармоніі. Сярод дырыжораў, якія зрабілі значны ўклад у станаўленне аркестра, А.Нікіш, С.Кусявіцкі, Э.Купер, В.Бярдзяеў, М.Малько, А.Гаўк, Ф.Штыдры, Я.Мравінскі, Ю.Цемірканаў і інш. Ігра аркестра адметная стройнасцю і шматтэмбравасцю гучання асобных аркестравых груп, віртуознай ансамблевай сыгранасцю, глыбінёй і незвычайнасцю трактоўкі выконваемых твораў. У рэпертуары ўвесь залаты фонд сусветнага сімфанізму ад твораў Л.Бетховена, П.Чайкоўскага, Дз.Шастаковіча да найскладанейшых партытур Г.Берліёза, Г.Малера, а таксама твораў Я.Сібеліуса, А.Рэспігі, Б.Бартака, П.Хіндэміта, Д.Міё, К.Шыманоўскага, І.Стравінскага. З аркестрам выступалі вядомыя дырыжоры і выканаўцы.

Л.А.Шымановіч.

САНКТ-ПЕЦЯРБУ́РГСКІ ВЯЛІ́КІ ДРАМАТЫ́ЧНЫ ТЭА́ТР акадэмічны імя Г.А.Таўстаногава. Адкрыты ў 1919, з 1932 імя М.Горкага, з 1964 акадэмічны, з 1992 сучасная назва. Створаны пры ўдзеле М.Горкага, М.Андрэевай і А.Блока як т-р гераічнага рэпертуару, класічнай трагедыі і высокай камедыі. Гал. рэжысёры А.Лаўрэнцьеў (1919—22 і 1923—29), К.Твярской (1929—34), В.Фёдараў (1934—36), А.Дзікі (1936—37), Б.Бабачкін (1938—40), Л.Руднік (1940—46), Н.Рашэўская (1946—49), І.Яфрэмаў (1950—52), К.Хахлоў (1922—23 і 1954—55), Таўстаногаў (1956—89); з 1989 маст. кіраўнік К.Лаўроў. Адкрыўся спектаклем «Дон Карлас» Ф.Шылера. Першапачаткова ставіліся спектаклі У.Шэкспіра, Шылера, В.Гюго, Мальера і інш., з сярэдзіны 1920-х г. таксама творы тагачаснай драматургіі, у якіх сцвярджалася рэаліст. скіраванасць: «Мяцеж» (1925), «Разлом» (1927) Б.Лаўранёва, «Клоп» (1929), «Баня» (1930) У.Маякоўскага. У 1930—40-я г. т-р ставіў творы М.Горкага («Мяшчане», «Дачнікі»), А.Чэхава («Вішнёвы сад») і інш. Спектаклям 1950—70-х г. уласцівы ўвага да сцэн. ўвасаблення вострых і напружаных жыццёвых калізій, яркая рэаліст. форма, сац.-гіст. і псіхал. абагульненні: «Ідыёт» паводле Ф.Дастаеўскага,

Санкт-Пецярбургскі вялікі драматычны тэатр імя Г.Таўстаногава.

«Ліса і вінаград» Г.Фігейрэду, «Варвары» і «Мяшчане» (Дзярж. прэмія СССР 1970) М.Горкага, «Кароль Генрых IV» Шэкспіра, «Гісторыя каня» паводле Л.Талстога. Пастаноўкі 1990-х г. вызначаліся глыбокай распрацоўкай псіхал. малюнка роляў, пошукам сучасных выразных магчымасцей у традыц. драматургіі: «Каварства і каханне» Шылера, «Макбет» Шэкспіра, «Бацька» А.Стрындберга, «Таленты і паклоннікі» А.Астроўскага і інш. У т-ры ў розныя гады працавалі і працуюць акцёры А.Абрамаў, А.Андрэеў, Г.Багачоў, А.Басілашвілі, Т.Дароніна, В.Дзягцяр, В.Іўчанка, Я.Капелян, У.Кузняцоў, Лаўроў, А.Лаўрэнцьеў, Я.Лебедзеў, П.Луспякаеў, Л.Макарава, М.Манахаў, В.Сафронаў, В.Паліцаймака, І.Смактуноўскі, У.Стржэльчык, А.Талубееў, М.Трафімаў, А.Фрэйндліх, З.Шарко, Ю.Юр'еў і інш.; рэжысёры Р.Дзіцяткоўскі, Р.Казлоў, Э.Нюганен, М.Пінігін, А.Сяроў, Т.Чхеідзе, А.Шапіра і інш.

С.У.Пешын.

САНКТ-ПЕЦЯРБУ́РГСКІ ІНСТЫТУ́Т ЖЫВАПІСУ, СКУЛЬПТУ́РЫ І АРХІТЭКТУ́РЫ акадэмічны імя І.Я.Рэпіна, старэйшая ў Расіі маст. вышэйшая навуч. ўстанова. Засн. ў 1757 у Пецярбургу як Выхавальнае вучылішча Імператарскай АМ (гл. *Расій-*

ская акадэмія мастацтваў). У 1894 пераўтворана ў Вышэйшае маст. вучылішча, у 1918 — у Петраградскія дзярж. вольныя маст.-вучэбныя майстэрні, у 1926 — Вышэйшы маст.-тэхн. ін-т, у 1934—44 — Ленінградскі ін-т жывапісу, скульптуры і архітэктуры, з 1944 імя Рэпіна, з 1992 сучасная назва. З 1933 уваходзіў у сістэму Усерасійскай АМ, з 1947 — АМ СССР, з 1992 — Расійскай АМ. Мае ф-ты жывапісу, графікі, скульптуры, архітэктуры, тэорыі і гісторыі мастацтваў, майстэрні станковага жывапісу, тэатр.-дэкарацыйнага жывапісу, манум. жывапісу, рэстаўрацыйную, аспірантуру. Сярод выкладчыкаў ін-та А.Мыльнікаў, М.Анікушкін, П.Фамін, Ю.Няпрынцаў, У.Ветрагонскі, А.Жук і інш. У ін-це вучыліся бел. мастакі і мастацтвазнаўцы З.Азгур, Н.Высоцкая, Я.Зайцаў, А.Мазалёў, П.Масленікаў, Г.Мурамцаў, В.Мурашоў, А.Паслядовіч, У.Стальмашонак, Я.Чамадураў, Н.Шчасная, А.Шыбнёў і інш.

С.У.Пешын.

САНКТ-ПЕЦЯРБУ́РГСКІ МАЛЫ́ ТЭА́ТР О́ПЕРЫ І БАЛЕ́ТА імя М.П.Мусаргскага. Адкрыты ў 1918 у будынку б. Міхайлаўскага т-ра (1833, арх. А.Брулоў). З 1919 Дзярж. акад. т-р камічнай оперы, з 1921 — Малы петраградскі дзярж. акад. т-р, з 1926 — Дзярж. акад. Малы оперны т-р, з 1964 — Ленінградскі Малы т-р оперы і балета, з 1989 імя Мусаргскага, з 1992 сучасная назва. Напачатку ставіліся камед. спектаклі, аперэты, аднаактовыя оперы: «Птушкі пеўчыя» Ж.Афенбаха (1918), «Цар-цясляр» А.Лорцынга (1919), «Верцер» Ж.Маснэ (1920), «Скупы рыцар» С.Рахманінава, «Цыганскі барон» І.Штрауса(1922) і інш. Пазней пастаўлены оперы «Нос» (1930) і «Лэдзі Макбет Мцэнскага павета» (1934) Дз.Шастаковіча; «Ціхі Дон» (1935) і «Узнятая цаліна» (1937) І.Дзяржынскага. З 1933 працуе і балетная трупа. Пастаўлены балеты «Светлы ручай» Шастаковіча (1935), «Каўказскі нявольнік» Б.Асаф'ева (1938) і інш. З 1941 т-р знаходзіўся ў г. Арэнбург, дзе ў 1943 пастаўлены оперы «Кроў народа» Дзяржынскага і «Мацней за смерць» В.Валошынава. З 1944 у Ленінградзе, працягваў прапагандаваць сучасныя творы і набыў вядомасць як т-р-эксперыментатар. Сярод пастановак: оперы «Вайна і мір» С.Пракоф'ева (1946), «Маладая гвардыя» Ю.Мейтуса (1950), «Вірынея» С.Сланімскага (1967), «Не толькі каханне» Р.Шчадрына (1973) і інш. З 1981 т-р узначаліў С.Гаўдасінскі, які лічыў гал. задачай адраджэнне ў т-ры рус. класікі. У рэпертуары гэтага часу — «Барыс Гадуноў» і «Хаваншчына» Мусаргскага, «Яўген Анегін» і «Пікавая дама» П.Чайкоўскага, «Залаты пеўнік» і «Казка пра цара Салтана» М.Рымскага-Корсакава, «Марыя Сцюарт» Сланімскага, «Пётр І» Ц.Хрэннікава; балеты «Макбет», «Баядэрка» Ш.Калаша і інш. Уклад у развіццё т-ра ўнеслі дырыжоры С.Самасуд, Б.Хайкін, А.Дзмітрыеў, Ю.Багданаў, П.Бубельнікаў, А.Аніханаў, А.Кукушкін, А.Сітнікаў; рэжысёры М.Смоліч, Э.Пасынкаў, У.Лук'янаў; балетмайстры Ф.Лапухоў, Л.Лаўроўскі, П.Гусеў, І.Бельскі, А.Вінаградаў, М.Баярчыкаў; хормайстары М.Траўкін, А.Чарноў; салісты оперы С.Балашоў, А.Галавін, К.Камісарава, А.Мадэстаў, А.Алмазаў, Т.Багданаў, А.Ступальскі, С.Шапашнікаў і інш.; балета В.Зімін, Ю.Літвіненка, Л.Сафронава, В.Станкевіч і інш. Салісты 1999—2001 Н.Бірукова, Н.Уласава, М.Трагубовіч, С.Акопаў, А.Барысевіч, С.Бурэеў, С.Дрэйт, М.Казанцаў, А.Пятроў і інш.

Л.А.Шымановіч.

САНКТ-ПЕЦЯРБУ́РГСКІ УНІВЕРСІТЭ́Т, адзін з буйнейшых ун-таў Расіі, навук. цэнтр. Засн. ў 1819 у Пецярбургу на базе Гал. пед. ін-та. Адкрыты ў 1820. Меў 3 ф-ты: гіст.-філал., філас.-юрыд., фіз.-матэматычны. У 1854 адкрыты ф-т усходніх моў, у 1-й пал. 19 ст. — кафедры валашскай, арм., груз., тат. і інш. моў. У 1956 ва ун-т (на правах ф-та) увайшоў Першы ленінградскі пед. ін-т замежных моў (з 1938). З 1970-х г. ун-т працуе як сістэма двух навучальна-навук. комплексаў — у С.-Пецярбургу і Петрадварцы. У 1994/95 навуч. г. ва ун-це больш за 17 тыс. студэнтаў, больш за 4 тыс. выкладчыкаў; ф-ты: геал., эканам., юрыд., філал., усх., гіст., філас., псіхалогіі, фіз., механіка-матэм., прыкладной матэматыкі, геаграфіі і геаэкалогіі, хім., біял.-глебавы, журналістыкі, менеджменту, міжнар. адносін. Аспірантура. У складзе ун-та каля 200 кафедраў, 10 НДІ, каля 200 н.-д. лабараторый і станцый, абсерваторыя; 2 музеі, навук. б-ка (больш за 6 млн. уліковых адзінак), выд-ва. Пры ун-це працуюць Цэнтр рус. мовы, ін-ты павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў вышэйшых, сярэдніх спец. і прафес.-тэхн. устаноў, вышэйшыя пед. курсы, акад. гімназія, школы-інтэрнаты фіз.-матэм. і біял.-хім. профілю. Выдае «Вестник» (з 1946, з 1956 — у 6 серыях).

У розны час у С.-П.у. працавалі А.М.Бекетаў (рэктар у 1876—83), А.М.Бутлераў, Э.Х.Ленц, Дз.І.Мендзялееў, А.С.Папоў, І.М.Сечанаў, А.А.Шахматаў; вучыліся І.Я.Білібін, А.А.Блок, А.К.Глазуноў, М.І.Глінка, І.І.Мечнікаў, М.М.Міклуха-Маклай, І.П.Паўлаў, Дз.І.Пісараў, Я.Райніс, І.С.Тургенеў, М.А.Урубель, М.Г.Чарнышэўскі, К.А.Ціміразеў і інш.

Літ.: 275 лет. Санкт-Петербургский государственный университет: Летопись 1724—1999. СПб., 1999.

САНКТ-ПЁЛЬТЭН (Sankt Pölten), горад на ПнУ Аўстрыі, на р. Трайзен, зямля Ніжняя Аўстрыя. Каля 50 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: маш.-буд., хім., тэкст., дрэваапр., цэлюлозна-папяровая, харчовая. Арх. помнікі 12—17 ст.

САНКУ́РУ (Sankuru), рака ў Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга, правы прыток р. Касаі (бас. Конга). Даўж. 1200 км, пл. бас. каля 156 тыс. км^2. У вярхоўях цячэ ў глыбока ўрэзанай даліне, утварае парогі і вадаспады. Паводкі ад вер.—кастр. да красавіка. Сярэдні расход вады каля 1700 м^3/с. Суднаходная на 580 км ад вусця. ГЭС. У бас. С. — здабыча алмазаў.

САНКЦЫІ (ад лац. sanctio строгая пастанова) у праве, меры ўздзеяння і рашэнні, якія маюць канчатковы характар (як правіла) і не падлягаюць перагляду. Маюць 4 асн. значэнні: 1) крымінальныя, адм., дысцыплінарныя ці маёмасныя меры, якія ўжываюцца да правапарушальніка і цягнуць для яго неспрыяльныя вынікі. Крымін. С. (пазбаўленне волі і інш.) прымяняюцца толькі судом, адм. С. (штраф, адм. арышт) — міліцыяй, дзярж. інспекцыяй і да т.п., дысцыплінарныя С. — службовымі асобамі і адміністрацыяй, маёмасныя С. — судом у спалучэнні з інш. мерамі. 2) Структурная частка агульнай *нормы права*, якая паказвае на магчымыя меры ўздзеяння на парушальніка дадзенай нормы. 3) Пастанова пракурора, якая дазваляе прымусовыя меры да асобы, што падазраецца ў злачынстве (узяцце пад варту, вобыск і інш.). 4) У міжнар. праве — меры ўздзеяння на дзяржаву, якая парушыла нормы гэтага права ці свае міжнар. абавязацельствы.

САНКЮЛО́ТЫ (франц. sans-culottes ад sans без + culotte кароткія штаны), тэрмін часоў *Французскай рэвалюцыі 1789—99*. Першапачаткова С. арыстакраты зняважліва называлі прадстаўнікоў гар. беднаты, якія насілі доўгія штаны з грубай матэрыі (у адрозненне ад дваран і буржуа, якія насілі кароткія штаны з шаўковымі панчохамі); пазней (асабліва ў час якабінскай дыктатуры 1793—94) тэрмін «С.» быў саманазвай радыкальных рэвалюцыянераў.

САН-ЛУ́ІС (São Luís), горад на ПнУ Бразіліі, на в-ве Сан-Луіс, злучаны з мацерыком мостам цераз праліў Сан-Маркус. Адм. ц. штата Мараньян. Засн. ў 1612. Каля 1 млн. ж. з прыгарадамі (2000). Вузел аўтадарог, чыг. станцыя. Марскі порт (вываз бавоўны, пальмавых арэхаў і алею, карнаубскага воску). Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: харчасмакавая, тэкст., хім., фармацэўтычная, паліграфічная. Ун-т.

САН-ЛУ́ІС-ПАТАСІ́ (San Luis Potosí), горад у Цэнтр. Мексіцы, на Мексіканскім нагор'і, на выш. каля 1900 м. Адм. ц. аднайменнага штата. Засн. ў 1576. Каля 750 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Цэнтр стараж. раёна здабычы серабра, свінцу, медзі, цынку. Прам-сць: чорная і каляровая металургія, с.-г. машынабудаванне, хім., харчовая; чыг. майстэрні, канатна-вяровачныя, шарсцяныя і інш. прадпрыемствы. Ун-т. Арх. помнікі 17—18 ст., у т.л. касцёлы ў стылі барока.

САН-МАРЦІ́Н (San Martin) Хасэ дэ (25.2.1778, Япею, Аргенціна — 17.8.1850),

адзін з кіраўнікоў *вайны за незалежнасць іспанскіх калоній у Амерыцы 1810—26*, нац. герой Аргенціны. Атрымаў ваен. адукацыю ў Іспаніі. У 1808—12 удзельнік вайны іспанцаў супраць франц. акупацыі. Пасля вяртання на радзіму (1812) далучыўся да барацьбы правінцый Ла-Платы супраць ісп. панавання, чл. масонскай ложы Лаўтара. З 1814 камандуючы Паўн. арміяй. Пасля абвяшчэння незалежных Аб'яднаных Правінцый Ла-Платы (1816) камандуючы Андскай арміяй. На чале яе перайшоў цераз Анды і ў бітвах пры Чакабука (лют. 1817) і Майпу (крас. 1818) разбіў ісп. войскі, у выніку чаго Чылі атрымала незалежнасць. У 1820—21 узначаліў паход у Перу, вызваліў ад іспанцаў ч. краіны; першы кіраўнік (пратэктар) урада Перу (1821—22). З-за рознагалоссяў з С.*Баліварам* у вер. 1822 падаў у адстаўку і выехаў у Еўропу.

Літ.: Штрахов А.И. Сан-Мартин — герой аргентинского народа // Латин. Америка. 1970. № 4.

САН-МАРЫ́НА (San Marino), Рэспубліка Сан-Марына (Repubblica di San Marino), дзяржава ў Еўропе, на Апенінскім п-ве, за 13 км ад Адрыятычнага мора. Абкружана тэр. Італіі. Пл. 60 км². Нас. 26,9 тыс. чал. (2000). Дзярж. мова італьянская. Сталіца — г. *Сан-Марына*. Падзяляецца на 9 адм. адзінак (замкаў). Нац. свята — гадавіна заснавання рэспублікі (3 вер.).

Дзяржаўны лад. С.-М. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя (Статут) 1600 (са зменамі). Вышэйшы заканад. орган — Вялікі ген. савет (аднапалатны парламент), які складаецца з 60 дэпутатаў (выбіраюцца насельніцтвам па прапарцыянальным прадстаўніцтве на 5 гадоў). Функцыі кіраўніка дзяржавы і выканаўчай улады выконваюць 2 капітаны-рэгенты, якія выбіраюцца Вял. ген. саветам са сваіх членаў на 6 месяцаў.

Прырода. Усю краіну займаюць адгор'і *Апенінаў* выш. да 739 м (г. Тытана). Клімат міжземнаморскі. Т-ра паветра ў студз. 4 °С, у ліп. 23 °С. За год выпадае 800—900 мм ападкаў, найб. у зімовы час. Невял. ўчасткі маквісу, дубовыя гаі.

Насельніцтва. Каля 80% складаюць санмарынцы, народ блізкі да італьянцаў. Жывуць таксама італьянцы. Каля 95% вернікаў — католікі. Сярэднегадавы прырост каля 0,6%. Сярэдняя шчыльн. каля 450 чал. на 1 км². Гарадскога насельніцтва больш за 91%. Гарады невялікія, ад 4 тыс. да 1 тыс. ж. Каля 55% насельніцтва занята ў сферы паслуг, каля 43% — у прам-сці, каля 2% — у сельскай гаспадарцы. Значная эміграцыя, каля 20 тыс. санмарынцаў жывуць за мяжой (найб. у Італіі).

Гісторыя. С.-М. — найстаражытнейшая з дзяржаў Еўропы. Яе ўзнікненне паданне адносіць да 301, легендарным заснавальнікам лічыцца хрысціянін каменячос Марына, які ўцёк сюды з Далмацыі ад рэліг. праследаванняў і пазней быў прылічаны да святых. Назва «Рэспубліка С.-М.» сустракаецца ў дакументах з 10 ст. У 11—13 і 15 ст. тэр. рэспублікі павялічылася за кошт суседніх зямель. У 19 ст. С.-М. неаднаразова была прыстанкам для італьян. рэвалюцыянераў — удзельнікаў *рысарджмента* (*карбанарыяў*, Дж.*Гарыбальдзі* і інш.). Пасля ўтварэння адзінай італьян. дзяржавы С.-М. ў 1862 заключыла з Італіяй дагавор пра сяброўства і добрасуседства (узнаўляўся ў 1872, 1897, 1953), паводле якога С.-М. фактычна апынулася пад італьян. пратэктаратам. У 1-й сусв. вайне рэспубліка ўдзельнічала на баку Антанты (выставіла 15 салдат). У 1923 да ўлады ў С.-М. прыйшлі фашысты. У 2-ю сусв. вайну рэспубліка абвясціла нейтралітэт, але ў вер. 1944 акупіравана ням. фашыстамі. У 1945—57 большасць у парламенце належала кааліцыі левых партый на чале з камуністамі і сацыялістамі. Да 1974 краінай кіравалі кааліцыйныя ўрады на чале з Хрысц.-дэмакр. партыяй, потым — кааліцыйны ўрад хрысц. дэмакратаў і сацыялістаў, з 1978 — кааліцыя левых партый, з 1986 — камуністаў і хрысц. дэмакратаў, з 1998 — сацыялістаў і хрысц. дэмакратаў.

У знешняй палітыцы С.-М. прытрымліваецца прынцыпаў нейтралітэту і недалучэння. С.-М. — чл. Савета Еўропы (з 1988) і ААН (з 1992). Асн. паліт. партыі і грамадскія арг-цыі, прадстаўленыя ў парламенце: Хрысц.-дэмакр. партыя, Сацыяліст. партыя, Прагрэсіўна-дэмакр. партыя (з 1990, б. камуністы),



Герб і сцяг **Сан-Марына**.



Да арт. **Сан-Марына**. Ландшафтная панарама каля падножжа г. Тытана.

Партыя камуніст. пераўтварэння, Нар. саюз дэмакратаў, Дэмакр. рух. Асн. прафсаюзы: сан-марынскія канфедэрацыя працы і дэмакр. канфедэрацыя працоўных.

Гаспадарка. Краіна высокага ўзроўню жыцця. Валавы ўнутр. прадукт у разліку на 1 чал. складае каля 20 тыс. дол. за год. Аснова эканомікі — абслугоўванне замежных турыстаў, дае каля 60% даходу краіны. Штогод С.-М. наведвае да 3,5—4 млн. чал. Турыстаў прываблівае стараж. гісторыя дзяржавы, шматлікія гіст. і арх. помнікі, маляўнічая прырода, узровень абслугоўвання. Значны міжнар. цэнтр банкаўскіх паслуг. Прам-сць прадстаўлена невял. прадпрыемствамі. Электраэнергія імпартуецца з Італіі. На тэр. С.-М. філіялы італьян. маш.-буд. і інш. фірм. Прадпрыемствы электронай, харч. (малочная і сыраварная, мясная, вінаробчая), тэкст. (шарсцяныя і трыкат. вырабы), металаапр., хім., мэблевай, цэм., гарбарнай, керамічнай, папяровай прам-сці. Здабыча цэм. сыравіны, буд. каменю, серы, вытв-сць буд. матэрыялаў. Саматужны і рамесніцкі выраб сувеніраў, у т.л. з металаў, шкла, маёлікі; ювелірных упрыгожанняў. Важная крыніца даходаў — выпуск паштовых марак і манет для нумізматаў. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца

каля 1,2 тыс. га зямлі. Пераважаюць дробныя гаспадаркі да 1 га. Сеюць пшаніцу, кукурузу, агародніну. Вінаградарства і вырошчванне аліўкавых дрэў. Гадоўля буйн. раг. жывёлы, авечак і свіней. Транспарт пераважна аўтамабільны. У С.-М. 220 км аўтадарог. Знешнія сувязі праз італьян. порт Рыміні. Краіна з 1954 у мытным і паштовым саюзе з Італіяй, якая штогод выплачвае С.-М. кампенсацыю за адмову ад даходаў, звязаных з мытнымі пошлінамі, радыё- і тэлецэнтрамі, ігральнымі дамамі і інш. Экспарт: віно, тэкст. вырабы, скуры, мэбля, кераміка, буд. камень; імпарт: спажывецкія і прамысл. тавары, паліва. Гандаль пераважна з Італіяй. Грашовая адзінка — італьян. ліра.

І.Я.Афнагель (прырода, насельніцтва, гаспадарка).

САН-МАРЫ́НА (San Marino), горад, сталіца дзяржавы *Сан-Марына*. Засн. ў 301. 2,3 тыс.ж., з прыгарадамі каля 4,5 тыс. ж. (1996). Невял. прадпрыемствы тэкст., папяровай, гарбарнай, металаапр., мэблевай прам-сці. Арх. помнікі 7—19 ст. Турызм.

САН-МІГЕ́ЛЬ (San Miguel), горад на У Сальвадора, каля падножжа вулкана Сан-Мігель, на Панамерыканскай шашы. Адм. ц. аднайменнага дэпартамента. Засн. ў 1530. Каля 200 тыс. ж. (2000). Прам-сць: алейная, тэкст., гарбарная. Цэнтр с.-г. раёна (кава, цукр. трыснёг, бавоўнік, хенекен; жывёлагадоўля). Сабор і касцёлы (18 ст.). Паблізу здабыча серабра.

САНМІКЕ́ЛІ (Sanmicheli) Мікеле (1484, г. Верона, Італія — 1559), італьянскі архітэктар; прадстаўнік Высокага Адраджэння. Зазнаў уплыў Д.*Брамантэ* і Дж. да Сангала. У 1509—27 на папскай службе ў Рыме, з 1528 гал. архітэктар крэпасцей Венецыянскай рэспублікі. Будаваў гар. ўмацаванні ў Брэшыі, Бергама, на в-ве Керкіра і інш. Узбагаціў

М.**Санмікелі**. Порта Паліо. 1557.

ордэрную сістэму складанымі дэкар. дэталямі, у т.л. матывамі рым. трыумфальнай аркі. Стваральнік новых тыпаў палацца, велічныя фасады якіх спалучалі строгую тэктоніку з выразнай пластыкай форм: палацца Бевілаква ў Вероне (1532), Грымані ў Венецыі (1556—72) і інш. Яго пабудовы ў Вероне ў многім вызначылі аблічча горада (вароты Порта Паліо, 1557; касцёл Мадонна ды Кампанья каля Вероны, з 1559).

СА́ННІКАВА ЗЯМЛЯ́, гіпатэтычны востраў у Паўн. Ледавітым ак. на Пн ад Новасібірскіх а-воў. Упершыню пра яго паведаміў рус. прамысловец і даследчык Я.Саннікаў у 1811, потым у 1886 і 1893 — Э.Толь. Пасля доўгіх пошукаў, у 1-й пал. 20 ст. ўстаноўлена, што С.З. не існуе. Верагодна, яна была разбурана морам і знікла як шэраг інш. астравоў, складзеных гал. ч. з выкапнёвага лёду.

СА́ННІКАВА ПРАЛІ́Ў. У Паўночным Ледавітым ак., паміж а-вамі Кацельны на Пн і Малы Ляхаўскі на Пд (Новасібірскія а-вы). Злучае моры Лапцевых і Усх.-Сібірскае. Даўж. 238 км, найменшая шыр. 55 км, глыб. 14—24 м. Круглы год укрыты льдамі. Названы імем Я.*Саннікава*.

СА́ННІКАЎ Алег Канстанцінавіч (14.9.1928, г. Гомель — 27.8.1983), бел. літаратуразнавец і тэатразнавец. Сын К.М.*Саннікава*. Канд. філал. н. (1961). Скончыў БДУ (1952). З 1957 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, з 1971 гал. рэдактар рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Мін-ва культуры Беларусі, з 1975 заг. кафедры тэорыі і гісторыі культуры Мінскага ін-та культуры. Даследчык бел. драматургіі і тэатра.

Тв.: Сатырычныя характары беларускіх камедый. Мн., 1961; Беларускі народны тэатр батлейка. Мн., 1962 (разам з Г.І.Барышавым); Беларускі народны тэатр «батлейка» і яго ўзаемасувязі з рускім «вяртэпам» і польскай «шопкай». Мн., 1963 (з ім жа).

СА́ННІКАЎ Канстанцін Мікалаевіч (30.5.1896, г. Рагачоў Гомельскай вобл. — 12.7.1965), бел. рэжысёр, акцёр, педагог. Нар. арт. Беларусі (1949). Праф. (1960). Скончыў Бел. драм. студыю ў Маскве (1926). Акцёрскую дзейнасць пачаў у 1916. З 1918 у Першым т-ве бел. драмы і камедыі. Адзін з заснавальнікаў БДТ (1920). З 1926 акцёр і рэжысёр БДТ-2. У 1929 паставіў першы самастойны спектакль «Маёмасць» паводле аповесці Г.Караваевай «Двор». У 1931—37 маст. кіраўнік БДТ-3, у 1937—61 у Бел. т-ры імя Я.Купалы (у 1948—52 гал. рэж.). З 1947 выкладаў у Бел. тэатр.-маст. ін-це.

К.М.**Саннікаў**.

К.**Саннікаў** у ролі князя Капусты (справа).

Яго спектаклям уласцівы грамадз. пазіцыя, вострае адчуванне сучаснасці, тонкае разуменне бел. нар. побыту і гумару, рамант. афарбоўка, паэтычнасць, выразнасць сцэнічнага малюнка. Зрабіў значны ўплыў на станаўленне бел. драматургаў К.Крапівы, А.Макаёнка, К.Губарэвіча, Э.Самуйлёнка, А.Маўзона і інш. Сярод роляў: Аляксей («Рысь» паводле аповесці Э.Ажэшкі «У зімовы вечар»), Васька Попел («На дне» М.Горкага), Максімілян («Цар Максімілян», нар. драма), Аберон («Сон у летнюю ноч» У.Шэкспіра), князь Капуста («Кацярына Жарнасек» М.Клімковіча) і інш. Сярод пастановак: «Мой сябар» М.Пагодзіна (1932), «Сяржант Дроб» і «Пагібель воўка» Самуйлёнка (1935, 1939), «Каварства і каханне» Ф.Шылера (1937), «Партызаны» (1938, з Л.Рахленкам), «Пяюць жаваранкі» (1950, Дзярж. прэмія СССР 1952), «Людзі і д'яблы» (1958) К.Крапівы, «Хлопец з нашага горада» (1941) К.Сіманава, «Канстанцін Заслонаў» А.Маўзона (1947, Дзярж. прэмія СССР 1948), «Цытадэль славы» і «На крутым павароце» Губарэвіча (1949, 1956), «Выбачайце, калі ласка!» Макаёнка (1954), «Смерць ваяводы» Ю.Славацкага (1959), «Любоў, Надзея, Вера» П.Васілеўскага (1961) і інш. Сярод вучняў Г.*Аўсяннікаў*, Л.*Давідовіч*, Г.*Дубаў*, М.*Захарэвіч* і інш.

Літ.: Кандрашына К.М. Канстанцін Саннікаў. Мн., 1981; Няфёд У.І. Гісторыя беларускага тэатра. Мн., 1982. *У.І.Няфёд.*

СА́ННІКАЎ Якаў (?—?), расійскі прамысловец, даследчык Новасібірскіх а-воў. У 1800 адкрыў і апісаў в-аў Сталбавы, у 1805 — Фадзееўскі. У 1808—10 удзельнічаў у экспедыцыі М.М.Гедэнштрома па даследаванні Новасібірскіх а-воў. У 1810 перасек в-аў Новая Сібір, у 1811 — в-аў Фадзееўскі. Выказаў меркаванне пра існаванне вял. зямлі на Пн ад в-ва Кацельны (гл. *Саннікава Зямля*). Яго імем названы праліў паміж а-вамі М.Ляхаўскі і Кацельны.

СА́ННЫ СПО́РТ, скарасны спуск на спарт. санках па спец. трасах. Спарт. санкі гібкія, з камбінаванымі (дрэва, метал) палазамі, выш. 15 см, даўж. 124—150 см, шыр. каляі да 45 см. Бываюць 1- і 2-месныя. Спартсмен кіруе санкамі лежачы на спіне, нагрузку на палазы змяняе пры дапамозе нацяжнога рэменя або перамяшчэннем цэнтра цяжару. Трасы штучныя, лядовыя на бетоннай ці драўлянай аснове, даўж. 700—1250 м, з 11—18 віражамі, шыр. лядовага жолаба 1,3—1,5 м, нахіл трасы да 10°.

Узнік у Швейцарыі ў канцы 19 ст. Першыя міжнар. спаборніцтвы адбыліся ў 1883 (г. Давос). Міжнар. аб'яднанне (Саюз) па С.с. ўзнікла ў 1913 (г. Дрэздэн, Германія), Міжнар. федэрацыя С.с. — у 1957. Чэмпіянаты Еўропы праводзяцца з 1914, свету — з 1955. З 1964 спаборніцтвы ўваходзяць у праграму Алімп. гульняў. Найб. развіты С.с. у Аўстрыі, Германіі, Італіі, Нарвегіі, Польшчы, Славакіі, Чэхіі, Швейцарыі і інш.

На Беларусі секцыя С.с. створана ў 1968 (Мінскі аўтазавод). 1-ы чэмпіянат Беларусі праведзены ў 1972.

А.М.Петрыкаў.

САНО́РНЫЯ ГУ́КІ, гл. ў арт. *Зычныя гукі.*

САНО́РСКАЯ БІЯГЕАГРАФІ́ЧНАЯ ВО́БЛАСЦЬ, адна з абласцей *Неарктыкі.* Займае сяроднюю ч. Паўн. Амерыкі (ад Канады да Мексікі) і п-аў Каліфорнія (акрамя яго паўд. часткі). Размешчана паміж *Канадскай біягеаграфічнай вобласцю* і *Неагеяй.* Уключае 3 падвобласці: Каліфарнійскую, Скалістых гор, або Цэнтральную, і Усходнюю, або Атлантычную.

У флоры яе зах. ч. пераважае ксерафітны тып расліннасці, у цэнтр. і ўсх. ч. — хваёва-шыракалістыя і шыракалістыя лясы, на Пд расліннасць мае субтрапічны характар. З рэліктаў захаваліся гіганцкая секвоя, тсуга, псеўдатсуга, туя. Найб. пашыраны розныя віды хвоі, дуба, клёна, платана, вяза, арэха, ясеня і інш. Шмат ліян, эпіфітаў. Характэрны зараснікі калючых кустоў — чапараль. У пустынях вял. колькасць кактусаў і інш. сукулентаў. Горныя лясы пераважна з хвоі і дуба. У фауне трапляюцца палеарктычныя і неатрапічныя групы жывёл, але ядро складаюць «агульнасанорскія», сярод якіх шмат эндэмікаў: апладонтавыя (горны бабёр), крот-зорканос, землярыйка-крот, каліфарнійскі кондар, вілахвосты каршун, бегаючая зязюля, спячы ляляк, гумавая змяя, грымучыя змеі, амбістомы, хвастатая жаба і інш. Найб. тыповыя прадстаўнікі: бізон, віларог, лугавы сабачка, кенгуровы пацук, каёт, віргінскі алень, скунс, куніца-рыбалоў, апосум, лугавы цецярук, кайманава чарапаха, ядазуб, жаба-бык і інш.

А.М.Петрыкаў.

САНО́РЫКА (ад лац. sonorus гучны, шумны) у м у з ы ц ы, від кампазіцыйнай тэхнікі, заснаванай на выкарыстанні маляўнічых гучанняў. Звязана з акцэнтаваннем каларыту і фарбаў, іх аўтанамізацыяй, у выніку чаго маляўнічы бок рэгулюе ўвесь гукавы працэс. У гіст.-стылявых адносінах вылучаюць 3 ступені-градацыі, якія адрозніваюцца вышынна-тонавай дыферэнцыяцыяй гучання: к а л а р ы с т ы к а, калі тоны ясна адрозніваюцца, але ўзмоцнены фанічны бок гучання (каларыстычная гармонія ў сцэнах зацьмення ў оперы «Князь Ігар» А.Барадзіна, перазвону ў оперы «Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага, каларыстычна афарбаваныя лініі ў эпізодзе «Шум лесу» Ф.Ліста); с а н о р ы к а, калі на першае месца выступаюць фарбы і адрозніваецца толькі частка тонаў (санорна афарбаваная і санорная гармонія ў творах К.Дэбюсі, А.Скрабіна, І.Стравінскага, С.Пракоф'ева, Дз.Шастаковіча, Б.Бартака, у «Атмасферах» Дз.Лігеці); с а н а р ы с т ы к а, калі выкарыстаны гукі без дакладна вызначанай вышыні, у выніку чаго ўзнікае санарыстычная гармонія і санарыстычны «шум» («Плач па ахвярах Хірасімы» К.Пендарэцкага, 1-я ч. канцэрта-буф С.Сланімскага). Прыкметы С. праявіліся ў трактоўцы гармоніі ў творах Ф.Шапэна, М.Рымскага-Корсакава, Мусаргскага, П.Чайкоўскага. Больш дакладна выкарыстоўваецца ў творах кампазітараў 20 — пач. 21 ст. У бел. музыцы С. ўласціва творам Л.Шлег (вакальна-сімф. дзеянне «Гуканне вясны»), С.Бельцюкова (для інстр. ансамбля «Стронцый-90», сімфонія № 1), В.Кузняцова («Канструкцыя для 67 выканаўцаў і магнітафоннай стужкі «Caesium-137»).

Р.І.Сергіенка.

Да арт. **Санорская біягеаграфічная вобласць**: 1 — цецярук лугавы; 2 — суслік калумбійскі; 3 — бізон; 4 — насуха; 5 — кондар каліфарнійскі; 6 — трус амерыканскі заходні; 7 — зязюля бегаючая; 8 — каршун слізняед; 9 — саракапут амерыканскі; 10 — рысь чырвоная.

САН-ПА́ЎЛУ (São Paulo), горад на ПдУ Бразіліі, у даліне р. Цьетэ, за 70 км ад узбярэжжа Атлантычнага ак. Адм. ц. аднайм. штата. Каля 10 млн. ж., разам з 37 гарадамі-спадарожнікамі ўтварае агламерацыю з нас. 17 755 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Найб. гандлёва-размеркавальны цэнтр краіны. Рынак кавы (вывозіцца праз порт Сантус). Важнейшы прамысл. цэнтр краіны (каля 40% прамысл. вытв-сці і занятых у прам-сці) і найб. эканамічна развітога раёна. Прам-сць: цяжкая (чорная і каляровая металургія, металаапрацоўка, аўтамабіле- і самалётабудаванне, чыг. машынабудаванне, электронная, эл.-тэхн., хім., гумава-тэхнічная; пераважна ў гарадах-спадарожніках), мясная (бойні), мясакансервавая, малочная, маслаперапрацоўчая, мукамольная, кандытарская, тытунёвая, тэкст. (больш за 50% вытв-сці тканін у краіне), швейная, гарбарна-абутковая, парфумерная, фармацэўтычная. Метрапалітэн. 3 ун-ты. Музеі: мастацкі, сучаснага мастацтва, археалогіі і этнаграфіі і інш. Тэатры. Палац урада (16 ст.), небаскробы (20 ст.). Спарт. збудаванні.

Засн. езуітамі 25.1.1554 у дзень св. Паўла (адсюль назва). У 16—18 ст. цэнтр кававых плантацый. У 1822 у С.-П. абвешчана незалежнасць Бразіліі ад Партугаліі. У пач. 19 ст. тут з'явіліся першыя ў краіне мануфактуры, у пач. 20 ст. ператварыўся ў буйны прамысл. цэнтр.

САН-ПЕ́ДРА-СУ́ЛА (San Pedro Sula), горад у Гандурасе. Адм. ц. дэпартамента Картэс. Засн. ў 1536. Каля 500 тыс. ж. (2000). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Гандл. цэнтр с.-г. раёна (бананы, цукр. трыснёг, жывёлагадоўля). Прам-сць харчасмакавая (цукр., кансервавая) і тэкстыльная.

САН-РЭ́МА (San Remo), прыморскі кліматычны курорт у Італіі. Размешчаны на беразе Лігурыйскага м., каля падножжа Прыморскіх Альпаў. Клімат мяккі міжземнаморскі, багатая субтрапічная расліннасць. З 2-й пал. 19 ст. міжнар. цэнтр турызму. Лячэнне захворванняў лёгкіх, функцыян. расстройстваў, нерв. сістэмы і інш. Шматлікія атэлі, пансіянаты, санаторыі. Вядомы як цэнтр кветкаводства, штогадовых міжнар. фестываляў італьян. песні (з 1951).

САН-РЭ́МА КАНФЕРЭ́НЦЫЯ 1920, пасяджэнне Вярх. савета дзяржаў Антанты 19—26.4.1920 у г. *Сан-Рэма* (Італія), дзе быў абмеркаваны шэраг пытанняў мірнага ўрэгулявання пасля 1-й сусв. вайны. Удзельнічалі прэм'ер-міністры Вялікабрытаніі (Д.*Лойд-Джордж*), Францыі (А.*Мільеран*), Італіі (Ф.Ніці), а таксама пасол Японіі (Мацуі), назіральнік ад ЗША і інш. Разгледжаны пытанні: аб мірным дагаворы з Турцыяй і размеркаванні мандатаў (гл. *Мандатныя тэрыторыі*) Лігі Нацый на араб. краіны; аб выкананні Германіяй ваен. артыкулаў *Версальскага мірнага дагавора 1919*; аб пазіцыі дзяржаў Антанты адносна Сав. Расіі («рус. пытанне»). Паводле рашэнняў канферэнцыі Вялікабрытанія атрымала мандат на Палесціну і Ірак (уключаючы г. Масул), Францыя — на Сірыю і Ліван. Быў зацверджаны папярэдні праект дагавора аб міры з Турцыяй, які пазней склаў аснову *Сеўрскага мірнага дагавора 1920*. Германія атрымала адмову на сваю просьбу аб павелічэнні ўдвая колькасці ўласных узбр. сіл (спроба рэвізіі ўмоў Версальскага міру), канферэнцыя запатрабавала ад герм. боку выконваць ваен. і рэпарацыйныя ўмовы Версальскага мірнага дагавора. Вырашана аднавіць гандл. сувязі з Сав. Расіяй, узяты курс на прызнанне яе дэфакта.

САНСАВІ́НА [Sansovino; сапр. Т а ц і (Tatti)] Якапа (2.7.1486, г. Фларэнцыя, Італія — 27.11.1570), італьянскі архітэктар і скульптар Высокага і Позняга Адраджэння. Вучыўся ў А.Сансавіна (узяў яго прозвішча) у Фларэнцыі. Працаваў у Рыме (1503—10 і 1518—27), Фларэнцыі (1510—18), Венецыі і Падуі (з 1529 гал. архітэктар Венецыянскай рэспублікі). Яго арх. творы ў Венецыі (палацца Корнер, з 1532, б-ка Сан-Марка, 1536—54; манетны двор, з 1536) адметныя пластычнай выразнасцю строгіх класічных форм, багаццем скульпт., а часам і жывапіснага ўбрання, тонка падначаленага тэктоніцы будынка. У скульптуры жывапісная гульня святлаценю спалучаецца з вытанчанай экспрэсіяй вобразаў («Вакх», 1518; 4 статуі на фасадзе Ладжэты ў Венецыі, 1540—45).

Я.**Сансавіна**. Бібліятэка Сан-Марка ў г. Венецыя. 1536—54.

САН-САЛЬВАДО́Р (San Salvador), горад, сталіца Сальвадора, у даліне р. Амакас, каля падножжа вулкана Сан-Сальвадор. Цэнтр. аднайм. дэпартамента. 1408 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). На Панамерыканскай шашы, вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Гал. эканам. і культ. цэнтр краіны. Прам-сць: харчасмакавая, тэкст. (баваўняная і шаўковая, вытв-сць вырабаў з хенекену), металаапр., гарбарна-абуткovая, дрэваапр., керамічная, мінер. угнаенняў. АН і Сальвадорская акадэмія гісторыі. 2 ун-ты. Кансерваторыя. Нац. музей. Бат. сад. Арх. помнікі калан. перыяду.

Засн. ў 1525 ісп. заваёўнікам П. дэ Альварада. У 1546 атрымаў гар. правы. У каланіяльныя часы тут знаходзілася рэзідэнцыя правіцыяльных улад. З 1826 сталіца рэспублікі Сальвадор (у 1831—39 сталіца Цэнтр.-Амер. Саюза). Шмат разоў быў разбураны землетрасеннямі (самае буйное ў 1854, апошняе ў 1988), пажарамі і паводкамі, у т.л. ў 1934.

САН-САЛЬВАДО́Р-ДЭ-ЖУЖУ́Й, поўная назва г. *Жужуй* на ПнЗ Аргенціны.

САНСА́РА (санскр., літар. — блуканне, кругаварот, пераход праз пэўныя станы), вучэнне ў індыйскіх рэлігіях (*індуізм*, *джайнізм*, *будызм*) і філасофіі пра пераўвасабленне, перараджэнне душы. Вытокі ідэі С. ў анамістычных уяўленнях аб роднаснасці ўсяго жывога і магчымасці пераходу паміж яго формамі (перараджэнне магчыма не толькі ў вобразе чалавека, але і бога, жывёлы) і ў ідэі аб перыядычным узнікненні і знішчэнні ўсяго, што існуе ў свеце. Ажыццяўляецца С. паводле законаў кармы: пасля смерці душа можа пераўвасобіцца ў сваёй ранейшай форме існавання або ў больш ці менш спрыяльных формах у залежнасці ад здзейсненых пры жыцці ўчынкаў. С. процілегласць *нірване* як канчатковаму выхаду з ланцуга перараджэнняў, духоўнаму выратаванню.

САН-СЕБАСЦЬЯ́Н (San Sebastián), горад на Пн Іспаніі, у аўт. вобласці Краіна Баскаў. Адм. ц. правінцыі Гіпускаа. Вядомы з 1014. Каля 200 тыс. ж. (2000). Порт у Біскайскім зал., вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд., у т.л. эл.-тэхн., вытв-сць станкоў, пад'ёмна-трансп. абсталявання; харч., тэкст., хімічная. Курорт і цэнтр турызму міжнар. значэння. Ун-т. Музеі этнагр., акіянаграфічны (з акварыумам). Арх. помнікі: позднагатычны касцёл Сан-Вісентэ (1507), кляштар Сан-Тэльма (1551, цяпер музей), ратуша. Традыц. парусныя рэгаты. Штогадовыя міжнар. кінафестывалі (з 1957).



Цэнтральная частка г. **Сан-Паўлу**.

САНСКРЫ́Т (ад санскр. апрацаваны), літаратурна апрацаваная мова арыйскай цывілізацыі ў Індыі (у процілегласць пракрыту — мове неадукаваных мас); адна з асн. стараж.-індыйскіх моў. Вызначаецца строга нармалізаванай граматыкай.

У фанетыцы С. 3 чыстыя галосныя (a, e, o), 2 глайды (i, u), плаўныя складовыя (ṛ, ḷ), багатая ўпарадкаваная сістэма зычных (з процілегласцю пастаўленнем звонкасці-глухасці, прыдыхальнасці-непрыдыхальнасці), свабодны націск, залежныя ад націску тоны; у марфалогіі — сямісклонавая сістэма імя, клічная форма, 3 роды і лікі, багатая сістэма катэго-

рый і форм дзеяслова; у лексіцы — вял. колькасць складаных слоў, часам эквівалентных сінтагме ці цэламу сказу. С. падзяляецца на ведыйскі (15—5 ст. да н.э.), эпічны (5 ст. да н.э. — 4 ст. н.э.) і класічны, або С. у вузкім сэнсе (2 — 16 ст. н.э.).

Санскрытамоўная культура мае найбагацейшую л-ру. Ведыйскія тэксты (гл. *Веды*) — творы рэлігійныя (гл. *Ведычная рэлігія*), маст., навук., філас., юрыдычныя, якія ў храналагічным парадку распадаюцца на 4 цыклы: Самгіта — збор гімнаў (Рыгведа і інш.), Брахманы — каментарый да Веды і інш., Упанішады — рэлігійныя і філас. аповесці, Сутры — звод розных практычных правіл. На эпічным С. створаны сусветнавядомыя эпасы «*Махабхарата*» і «*Рамаяна*». Класічны С. прадстаўлены ў першую чаргу тэкстамі інд. граматыстаў. Нормы класічнага С. выкладзены ў граматыцы Панініі (5—4 ст. да н.э.). На пісьме выкарыстоўваліся пераважна разнавіднасці шрыфту дэванагары. У Індыі С. выкарыстоўваецца як мова гуманітарных навук і культу. З адкрыццём і пачаткам вывучэння С. ў Еўропе звязана зараджэнне *параўнальна-гістарычнага мовазнаўства*.

Літ.: Иванов В.В., Топоров В.Н. Санскрит. М., 1960; Барроу Т. Санскрит: Пер. англ. М., 1976; Кочергина В.А. Санскритско-русский словарь. 2 изд. М., 1987. *А.Я.Міхневіч.*

САН-СТЭФА́НСКІ МІР 1878, папярэдні мірны дагавор паміж Расіяй і Турцыяй, які завяршыў рус.-тур. вайну 1877—78. Падпісаны 3.3.1878 у Сан-Стэфана (цяпер Ешылькёй каля Стамбула). Паводле С.-С.м.д. Чарнагорыя, Сербія і Румынія атрымлівалі поўную незалежнасць ад Турцыі, іх тэрыторыі значна пашыраны; Боснія і Герцагавіна набывалі аўтаномію ў рамках Асманскай імперыі; Балгарыя, у межы якой уключалася і гіст. *Македонія*, ператваралася ў падвасальнае Турцыі аўт. княства з правам выбрання сабе князя. Расія атрымлівала землі ў Закаўказзі з гарадамі Батумі, Карс, Ардаган і Баязет, а таксама страчаную ў выніку *Крымскай вайны 1853—56* Паўд. Бесарабію (акрамя астравоў у дэльце р. Дунай), узамен якой Румыніі перададзена Турцыяй Паўн. *Дабруджа*. У выніку процідзеяння вядучых еўрап. дзяржаў, асабліва Вялікабрытаніі і Аўстра-Венгрыі, С.-С.м.д. быў заменены на *Берлінскім кангрэсе 1878* шматбаковым дагаворам, які быў значна менш выгадны для Расіі і Балгарыі (захавала аўтаномію, але страціла б.ч. тэрыторыі).

САНТА-А́НА (Santa Ana), горад у ЗША, на Пд штата Каліфорнія, каля г. Лос-Анджэлес. Засн. ў 1869. 300 тыс. ж., з г. Анахайм і агульнымі прыгарадамі больш за 2 млн. ж. (1998). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорты. Прам-сць: вытв-сць радыёэлектроннага абсталявання (пераважна для ваен. мэт), агульнае машынабудаванне, металаапр., прыладабуд., харчовая. Кліматычны курорт.

САНТА-А́НА (Santa Ana), горад на З Сальвадора, каля падножжа вулкана Санта-Ана. Адм. ц. аднайм. дэпартамента. Засн. ў 1569. Каля 300 тыс. ж. (2000). На Панамерыканскай шашы, вузел чыгунак і аўтадарог. Другі, пасля сталіцы, па эканам. значэнні горад. Цэнтр раёна вырошчвання кавы. Прам-сць: харчасмакавая (вытв-сць растваральнай кавы, тытунёвых вырабаў), тэкст., запалкавая. Арх. помнікі калан. перыяду.

САНТА-ДАМІ́НГА (Santo Domingo), горад, сталіца Дамініканскай Рэспублікі, на паўд. узбярэжжы в-ва Гаіці. 3599 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Вузел аўтадарог, порт на Карыбскім м. Міжнар. аэрапорт. Найважнейшы эканам. і культ. цэнтр, дае больш за палавіну прамысл. прадукцыі краіны. Прам-сць: харчасмакавая (цукр., ромавая, алейная, мылаварная, тытунёвая), тэкст., швейная, гарбарна-абутковая, цэм., лесапільная, мэблевая. Акадэміі: мовы, гісторыі, музычная. 2 ун-ты. Горад перыядычна церпіць ад ураганаў. Цэнтр турызму.

Санта-Дамінга. Вежа Торэ дэль Аменахе.

Засн. ў 1496 Б.Калумбам (братам Х.Калумба) пад назвай Новая Ізабела, потым названы С.-Д. У 1538 у горадзе засн. ун-т. У 16 ст. тут знаходзілася рэзідэнцыя віцэ-караля ісп. калоній у Амерыцы. З 1844 сталіца Дамініканскай Рэспублікі. У 1916—24 акупіраваны амер. войскамі. У 1930 горад знішчаны ўраганам. Пасля адбудовы ў 1936 атрымаў назву Сьюдад-Трухільё (з 1962 зноў С.-Д.). У 1965 горад — арэна баёў паміж урадавымі войскамі і сіламі хунты.

У 1-й пал. 16 ст. горад набыў рэгулярную планіроўку. Забудоўваўся магутнымі каменнымі збудаваннямі ў стылі, пераходным ад готыкі да рэнесансу: манум. вежа Торэ дэль Аменахе (1503—07), замак-палац Каса дэль Альмірантэ (1510—14), сабор (1512—40) з грабніцай Х.Калумба, палац Каса дэ Энгомбе (1535), шпіталі, кляштары, 2-павярховыя жылыя дамы з унутр. дворыкамі. У 1543—1702 узведзены гар. сцены (захаваліся часткова). Пасля ўрагану 1930 узводзяцца жалезабетонныя будынкі. Сярод значных пабудоў 20 ст. — т-р (1913), атэль «Ярагуа» (1943) і інш. Музеі: нац., Нац. маст. галерэя і інш. Калан. цэнтр С.-Д. ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

САНТА-ІСАБЕ́ЛЬ (Santa Isabel), назва да 1973 сталіцы Экватарыяльнай Гвінеі г. *Малаба*.

САНТА-КРУС (Santa Cruz), Санта-Крус-дэ-ла-Сьера, горад у цэнтр. ч. Балівіі. Адм. ц. аднайм. дэпартамента. Засн. ў 1560. 1065 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Чыг. станцыя на чыгункі ў Бразілію і Аргенціну, вузел аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Эканам. цэнтр усх. ч. краіны. Прам-сць: харчасмакавая (вінаробчая, цукр., тытунёвая, шакаладная), гарбарна-абутковая, дрэваапрацоўчая; у прыгарадзе Эль-Пальмарэ нафтаперапрацоўка. Цэнтр раёна арашальнага земляробства (бавоўнік, цукр. трыснёг, тытунь, рыс, кава, какава). Ун-т. Арх. помнікі каланіяльнага перыяду.

САНТА-КРУС-ДЭ-ТЭНЕРЫ́ФЕ (Santa Cruz de Tenerife), горад у Іспаніі, на Пн в-ва Тэнерыфе (Канарскія а-вы). Адм. ц. аўт. вобл. Канарскія а-вы і прав. Санта-Крус-дэ-Тэнерыфе. Каля 250 тыс. ж. (2000). Порт на Атлантычным ак., бункерная база для трансатлантычных рэйсаў. Ун-т (з 1701). Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: нафтаперапр., хім., металаапр., вінаробчая. Кліматычны курорт.

САНТА́ЛАВАЕ ДРЭ́ВА, сандалавае дрэва, белае, індыйскае (Santalum album), кветкавая расліна сям. санталавых. Пашырана ў Індыі, на п-ве Малака і астравах Малайскага архіпелага. Здаўна культывуецца ў Індыі, Кітаі і інш.

Дрэва выш. каля 10 м, вечназялёнае, з густой кронай. Належыць да *раслін-паўпаразітаў*. Лісце супраціўнае. Кветкі зеленаватыя, чырв., часам жоўтыя. Плод — касцянка. Драўніна з жаўтавата-карычневым ядром і белай абалонай, пахучая, мае ў сабе эфірны алей (3—6%), цвёрдая, трывалая, устойлівая да тэрмітаў. Ідзе на маст. вырабы, курыльныя палачкі для рэліг. цырымоній і інш. Алей выкарыстоўваецца ў парфумерыі і медыцыне. Часам тэрмінам «сандалавае дрэва» наз. дрэвы (бафія, дэрыс і інш.), якія маюць прыгожую і духмяную драўніну. Гл. таксама *Кампешавае дрэва*. *В.М.Прохараў.*

Галінка **санталавага** дрэва.

САНТА-МА́РТА (Santa Marta), горад на Пн Калумбіі. Адм. ц. дэпартамента Магдалена. Засн. у 1525 (найстараж. горад у Калумбіі). Каля 300 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Порт на Карыбскім м., чыг. ст., вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць харч. і тэкстыльная. Цэнтр рыбалоўства. Тэхн. універсітэт. Арх. помнікі 17—18 ст.

САН-ТАМЕ́ (São Tomé), горад, сталіца дзяржавы Сан-Таме і Прынсіпі, на ўсх. беразе в-ва Сан-Таме ў Гвінейскім зал. Засн. партугальцамі ў канцы 15 ст. Каля 50 тыс. ж. (2000). Марскі порт, вузел аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: харч. і харчасмакавая, у т.л. перапрацоўка какавы, рыбы, прадпрыемствы па вырабе мыла, вапны, безалкагольных напіткаў, апрацоўцы драўніны.

САН-ТАМЕ́ І ПРЫ́НСІПІ (São Tomé e Príncipe), Дэмакратычная Рэспубліка Сан-Таме і Прынсіпі (República Democrática de São Tomé e Príncipe), дзяржава на а-вах Сан-Таме (пл. 836 км²), Прынсіпі (пл. 128 км²) і інш. у Гвінейскім зал., каля зах. берагоў Афрыкі. Пл. 1 тыс. км². Нас. 154,9 тыс. чал. (1999). Сталіца — г. Сан-Таме. Дзярж. мова — партугальская. Падзяляецца на 2 правінцыі. Нац. свята — Дзень незалежнасці (12 ліп.).

Герб і сцяг **Сан-Таме і Прынсіпі**.

Дзяржаўны лад. С.-Т. і П. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1990. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт, які выбіраецца на ўсеагульных выбарах на 5 гадоў. Заканад. орган — Нац. народны сход (55 дэпутатаў), які выбіраецца на 4 гады. Выканаўчая ўлада — Савет Міністраў на чале з прэм'ер-міністрам, якога прызначае прэзідэнт.

Прырода. У рэльефе астравоў, складзеных пераважна з базальтаў, вылучаюцца вулканічныя конусы (выш. да 2024 м на в-ве Сан-Таме, да 821 м на в-ве Прынсіпі). На в-ве Прынсіпі клімат экватарыяльны вільготны, на в-ве Сан-Таме — пераходны да трапічнага з дажджлівым (кастр. — май) і сухім (чэрв. — вер.) сезонамі. Сярэднія месячныя т-ры ад 23 да 27°С. Ападкаў за год ад 1000 мм на ўзбярэжжах да 2000—3000 мм у гарах. Натуральная расліннасць — густыя вільготна-экватарыяльныя лясы з кашт. пародамі дрэў (у т.л. эбенавае дрэва), ёсць другасныя хмызнякі, у вусцях рэк — мангравыя зараснікі. У жывёльным свеце шмат птушак і насякомых. Мора багатае рыбай, ракападобнымі і малюскамі.

Насельніцтва. Жывуць сантамійцы (саманазва тонгаш), нашчадкі афрыканцаў-рабоў, вывезеных у 15—16 ст. з краін Зах. і Паўд. Афрыкі; часткова афрыкана-партугальскія метысы. Ёсць невял. групы партугальцаў і нядаўніх эмігрантаў з краін Зах. Афрыкі. Сярод вернікаў пераважаюць католікі, ёсць пратэстанты; захоўваюцца мясц. вераванні. Сярэднегадавы прырост больш за 3%. Сярэдняя шчыльн. 155 чал. на 1 км². 95% нас. пражывае на в-ве Сан-Таме, дзе на ўзбярэжжы шчыльн. больш за 300 чал. на 1 км². У гарадах жыве каля 40% нас., у т.л. ў г. Сан-Таме каля 50 тыс. ж. Большая ч. насельніцтва занятая ў сельскай гаспадарцы і рыбалоўстве.

Да арт. **Сан-Таме і Прынсіпі**. Ландшафт на востраве Сан-Таме.



Гісторыя.На момант адкрыцця ў 1470—71 партуг. мараплаўцамі Ж. ды Сантарэнам і П.Эшкабарам астравы былі незаселены. З 1485 пачалася іх каланізацыя партугальцамі. У пач. 16 ст. тут створаны плантацыі цукр. трыснягу, для працы на якіх прывозілі рабоў з Афрыкі, найб. з Анголы. Рабы часта ўзнімалі паўстанні, найбуйн. з іх адбылося ў 1595—96. Змешанае насельніцтва (мулаты) было свабоднае, але непаўнапраўнае. Пасля скасавання ў 1875 рабства гал. галіной эканомікі стала вытв-сць какавы і кавы. У 1951 астравы атрымалі статус заморскай тэрыторыі, а ў 1972 — мясц. аўтаноміі Партугаліі. У 1953 адбылося паўстанне ў падтрымку незалежнасці краіны, якое было задушана партуг. войскамі. З 1960 барацьбу за незалежнасць астравоў вёў створаны ў эміграцыі К-т за вызваленне С.-Т. і П. (з 1972 — Рух за вызваленне, РВСТП). Пасля рэвалюцыі ў Партугаліі (крас. 1974) новы партуг. ўрад прызнаў незалежнасць астравоў.

12.7.1975 абвешчана Дэмакр. Рэспубліка С.-Т. і П., а лідэр РВСТП М.Пінту да Кошта стаў яе першым прэзідэнтам. У краіне быў усталяваны аднапартыйны рэжым РВСТП і абвешчаны курс на сацыяліст. будаўніцтва і супрацоўніцтва з сацыяліст. краінамі. Цяжкае эканам. становішча ў 1980-я г. прымусіла ўрад С.-Т. і П. пачаць збліжэнне з краінамі Захаду і лібералізацыю паліт. і эканам. жыцця. У жн. 1990 прынята канстытуцыя краіны, якая ўвяла прамыя прэзідэнцкія выбары, шматпартыйнасць і грамадз. свабоды. На першых свабодных выбарах у студз. 1991 перамагла апазіцыя, лідэр якой М.Траваада ў сак. 1991 абраны прэзідэнтам краіны. У 1990-я г. ажыццёўлены рынкавыя рэформы ў эканоміцы, але эканам. становішча краіны застаецца складаным. Яна моцна залежыць ад замежнай эканам. дапамогі. С.-Т. і П. — чл. ААН (з 1975). Дзейнічаюць паліт. партыі і арг-цыі: Рух за вызваленне С.-Т. і П., Партыя дэмакр. канвергенцыі — група незалежнае дэмакр. дзеянне, кааліцыя дэмакр. апазіцыі.

Гаспадарка. Слабаразвітая с.-г. краіна монакультурнай арыентацыі. Штогадовы даход на 1 чал. 1100 дол. Сельская гаспадарка дае 23% даходаў краіны, прамсць — 19%, абслуговыя галіны — 58%. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 40 тыс. га зямлі. Каля 10 тыс. га пастаянна арашаецца. Пераважаюць дробныя

сял. гаспадаркі, ёсць дзярж. плантацыі. Гал. культура — какава, займае каля 28 тыс. га, штогадовы збор каля 10 тыс. т. Інш. экспартныя культуры: кава, какосавая і алейная пальмы, бананы, ваніль, карыца, перац, кола, хіннае дрэва. На ўласныя патрэбы на невял. плошчы вырошчваюць маніёк, ямс, фасолю, проса, кукурузу, агародніну. Трапічнае садоўніцтва (асабліва хлебнае дрэва і папайя, або дыннае дрэва). Жывёлагадоўля развіта слаба, пад лугамі і пашай каля 1 тыс. га. Пераважае гадоўля буйн. раг. жывёлы (каля 3 тыс. галоў) і свіней. Птушкагадоўля. Рыбалоўства, лоўля чарапах і асьміногаў. З галін прам-сці найб. развіты харч. (мукамольная, алейная, рыбаперапрацоўчая, піваварная), тэкст., мылаварная, лесапільная і дрэваапрацоўчая, буд. матэрыялаў. Вытв-сць электраэнергіі 15 млн. кВт · гадз (1998) на невял. цеплавых электрастанцыях і ГЭС. Саматужныя промыслы і рамёствы. Транспарт пераважна аўтамабільны і марскі. На астравах 320 км аўтадарог, у т.л. 218 км з цвёрдым пакрыццём. Асн. парты Сан-Таме і Санту-Антонью, 2 аэрапорты, у т.л. міжнар. на в-ве Сан-Таме. У 1997 экспарт склаў 5,3 млн. дол., імпарт 19,2 млн. дол. У экспарце пераважаюць какава (90%), кава, пальмавы алей, копра, рыбапрадукты; у імпарце — харч. і прамысл. тавары, нафтапрадукты. Асн. гандл. партнёры: Партугалія, Нідэрланды, Францыя. Турызм. Краіна атрымлівае эканам. дапамогу ад міжнар. арг-цый і асобных краін, на 1995 яна склала 57,3 млн. дол. Грашовая адзінка — добра.

І.Я.Афнагель (прырода, насельніцтва, гаспадарка).

САНТАНДЭ́Р (Santander), горад на Пн Іспаніі. Адм. ц. аўт. вобласці і правінцыі Кантабрыя. Каля 200 тыс. ж. (2000). Порт на Біскайскім зал., вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: чорная металургія, судна- і самалётабудаванне, вытв-сць электраабсталявання, хім., тэкст., харчасмакавая, у т.л. рыбакансервавая і тытунёвая. Цэнтр рыбалоўства. 2 ун-ты. Кліматычны прыморскі курорт. Гатычны сабор (13 ст.) і кляштар (14 ст.).

САНТАРЫ́Н, другая назва групы астравоў у Эгейскім м., у архіпелагу Кіклады, тэр. Грэцыі, гл. *Тыра*.

СА́НТА-ФЕ (Santa Fe), горад на У Аргенціны, на р. Парана. Адм. ц. аднайм. правінцыі. Засн. у 1573. Каля 350 тыс. ж. (2000). Рачны порт, даступны для марскіх суднаў. Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: мукамольная, мясахаладабойная, гарбарна-абутковая, металаапрацоўчая; вытв-сць экстракту кебрача. 2 ун-ты. Музеі: гіст., прыродазнаўчых навук. Арх. помнікі 17 — пач. 19 ст.

СА́НТА-ФЕ-ДЭ-БАГАТА́ (Santa Fe de Bogotá), поўная назва сталіцы Калумбіі, гл. *Багата*.

«СА́НТА-ЧЭЧЫ́ЛІЯ» АКАДЭ́МІЯ, Нацыянальная акадэмія «Санта-Чэчылія» (Accademia Nazionale di Santa Cecilia), музычная ўстанова ў Рыме, якая аб'ядноўвае акадэмію, кансерваторыю, сімф. аркестр, муз. б-ку, музей муз. інструментаў і інш. Засн. ў 1566 як т-ва (кангрэцыя) музыкантаў (узначальваў Дж.Палестрына), члены якой збіраліся ў розных цэрквах, у т.л. ў базіліцы Санта-Чэчылія (адсюль назва). З 1689 т-ва кіравала фактычна ўсёй прафес. муз. дзейнасцю ў Італіі. У 1838 пераўтворана ў акадэмію. З 1876 яна размясцілася ў б. кляштары Арсаліне, арганізавала муз. ліцэй (з 1919 — кансерваторыя «Санта-Чэчылія»). У 1895 у будынку акадэміі адчынена канцэртная зала. Б-ка акадэміі — адно з найб. муз. сховішчаў свету. З 1956 кожныя 3 гады акадэмія праводзіць Міжнар. конкурс арк. дырыжораў.

САНТАЯ́НА (Santayana) Джордж (16.12.1863, Мадрыд — 26.9.1952), амерыканскі філосаф, пісьменнік, прадстаўнік *крытычнага рэалізму* ў філасофіі. Праф. Гарвардскага ун-та (1907—12). Філас. погляды С. спалучаюць рысы ідэалізму і матэрыялізму. Стваральнік канцэпцыі метафізічнай сістэмы быцця, якое разглядаў як сукупнасць 4 царстваў: матэрыі, сутнасці, ісціны і духа. У трактоўцы сутнасці рэчаў набліжаўся да *платанізму*: прызнаваў аб'ектыўнае існаванне матэрыяльнага свету, але даступнай пазнанню лічыў выключна сутнасць. На думку С., абсалютная верагоднасць уласціва толькі феноменам свядомасці і духоўных утварэнняў, таму што яны надаюць быццю якасную акрэсленасць. Паводле С., пазнанне не адлюстроўвае рэчаіснасці; веды аб знешнім свеце адрозніваюцца суб'ектыўным, сімвалічным характарам, а найвышэйшай формай светаразумення з'яўляецца міф. У этыцы падтрымліваў канцэпцыю эскапізму, паводле якой шляхам да шчасця з'яўляецца вызваленне духу ад плоці, свету і пазнання. У сац. тэорыі прытрымліваўся прынцыпу біялагізму: развіццё грамадства звязваў з імкненнем да самазахавання. Для паліт. поглядаў С. характэрны крытыка дэмакратыі і падтрымка ідэі панавання «эліты». Аўтар прац «Жыццё розуму» (т. 1—5, 1905—06), «Царствы быцця» (т. 1—4, 1927—40), рамана «Апошні пурытанін» (1935) і інш.

В.І.Боўш.

СА́НТУ-АНДРЭ́ (Santo André), горад на ПдУ Бразіліі, уваходзіць у склад Вял. Сан-Паўлу. Засн. ў 1549. Каля 700 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: цяжкая (чорная і каляровая металургія, машынабудаванне, гумавата-тэхнічная, хімічная), гарбарна-абутковая, тэкст., харчасмакавая, паліграфічная.

СА́НТУС (Santos), горад на ПдУ Бразіліі, на ўзбярэжжы бухты Сантус Атлантычнага ак., у штаце Сан-Паўлу. Засн. ў 1532. Каля 450 тыс. ж. (2000). Буйны порт, абслугоўвае прамысл. і с.-г. раён *Сан-Паўлу* (каля 75% бразільскага экспарту кавы, вываз бавоўны, фруктаў, прамысл. прадукцыі). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: харч. (мукамольная, цукр., кансервавая), металаапр., мінер. угнаенняў. Цэнтр рыбалоўства. Музей рыбалоўства. Касцёлы 16—18 ст. Турызм. Паблізу г. Кубатан — буйны цэнтр нафтаперапр. і нафтахім. прам-сці.

СА́НТУШ (Santos) Жазе Эдуарду Душ (н. 28.8.1942, Луанда), ангольскі дзярж. і паліт. дзеяч. Скончыў Бакінскі ін-т нафты і газу (1969). З 1961 чл. *Народнага руху за вызваленне Анголы* (МПЛА), з 1974 чл. яго Палітбюро, у 1977—79 сакратар ЦК МПЛА. У 1970—74 удзельнічаў ва ўзбр. барацьбе супраць партуг. панавання ў Анголе, ген. арміі. З 1975 міністр замежных спраў Нар. Рэспублікі Ангола (НРА), з 1976 — 1-ы нам. прэм'ер-міністра НРА, у 1978—79 міністр планавання. У 1979 абраны старшынёй МПЛА, што паводле канстытуцыі НРА зрабіла яго прэзідэнтам НРА. На першых усеагульных свабодных выбарах у вер. 1992 абраны прэзідэнтам Анголы.

САНТЫ... (ад лац. centum сто), дзесятковая прыстаўка для ўтварэння найменняў *дольных адзінак*, роўных 1/100 ад выходных адзінак. Пазначаецца с. Напр., 1 см (сантыметр) = 0,01 м.

САНТЫМЕ́ТР, адзінка даўжыні, роўная сотай долі *метра*. Абазначаецца см. 1 см=10^{-2}м. Асн. адзінка даўжыні, а таксама адзінка эл. ёмістасці і індуктыўнасці ў *СГС сістэме адзінак*.

САНТ-Э́ЛІЯ (Sant' Elia) Антоніо (30.4.1888, г. Кома, Італія — 10.10.1916), італьянскі архітэктар. Вучыўся ў акадэміі Брэра і політэхн. ін-це ў Мілане, скончыў Школу прыгожых мастацтваў у Балонні (1912). Зазнаў уплыў О.*Вагнера* і рацыяналістычнай архітэктуры ЗША. У сваіх поглядах блізкі да італьян. футурызму. На выстаўцы групы «Новыя традыцыі» прадставіў рамант. праект «горада будучага» (не ажыццёўлены), асноваў формаўтварэння якога быў дынамічны рух: размяшчэнне трансп. магістралей на розных узроўнях, будынкі з вял. ліфтамі, эскалатарамі і г.д. У 1914 С.-Э. з арх. Ф.Т.Марынеці выдаў «Маніфест футурыстычнай архітэктуры». Праекты С.-Э. паўплывалі на горадабуд. канцэпцыі 20 ст. Загінуў на фронце ў 1-ю сусв. вайну.

І.М.Скварцова.

САНТЭ́ХНІКА, тое, што *санітарная тэхніка*.

САНТ'Я́ГА (Santiago), горад, сталіца Чылі. Знаходзіцца ў цэнтр. ч. краіны, каля падножжа Анд (на выш. каля 540 м), на абодвух берагах р. Мапоча. 5538 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Праходзіць Панамерыканская шаша, вузел чыгунак і аў-

тадарог. 4 міжнар. аэрапорты. Гал. эканам., культ. і навук. цэнтр краіны. У С. сканцэнтравана каля палавіны апрацоўчай прам-сці краіны. Прам-сць: маш.-буд., у т.л. эл.-тэхн.; металаапр., хім., тэкст., гарбарна-абутковая, паліграф., харч., фармацэўтычная, гумавая, тэкстыльная. Метрапалітэн. Акадэміі: навук, мовы, гісторыі, прыродазнаўчых навук. 3 ун-ты (найстарэйшы з 1738). Ін-т па вывучэнні Антарктыды. Музеі: Нац. гістарычны, Нац. выяўл. мастацтва і музыкі, сучаснага мастацтва і інш. Тэатры. 2 абсерваторыі. Бат. сад.

Засн. ў 1541 іісп. канкістадорам П. дэ Вальмі. У 1818 каля С. рэв. сілы пад камандаваннем ген. Х.Сан-Марціна атрымалі вырашальную перамогу над іспанцамі. З 1818 С. — сталіца незалежнай Чылі.

У 16 ст. горад набыў строга рэгулярную планіроўку, забудаваны аднолькавымі нізкімі і шырокімі дамамі з унутр. дворыкамі. У цэнтры Пласа дэ Армас з будынкамі калан. часу: сабор (1541—1619, перабудаваны ў 1647 і 1679, барока; сучасны будынак — 1780—99, арх. Х.Таэска-і-Рычы, класіцызм), ратуша (1775—1807, арх. Таэска-і-Рычы, М. дэ Хара Кемада) і інш. План развіцця С. (складзены ў 1841—53) прадугледжваў пераважна парадную забудову цэнтра. У 19—20 ст. С. значна вырас, але пераважае невысокая забудова (3—5, у цэнтры 8—12 паверхаў). На У раён віл, сатунь, кава, какава, рыс, жывёлагадоўля). 2 ун-ты. Паблізу здабыча золата.

САНТ'ЯГА-ДЭ-КУ́БА (Santiago de Cuba), горад на ПдУ Кубы. Адм. ц. аднайм. правінцыі. Каля 500 тыс. ж. (2000). Порт на Карыбскім м., вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Другі пасля сталіцы эканам. і культ. цэнтр краіны. Прам-сць: харчасмакавая (тытунёвая, вінна-лікёрная, цукр., рыбакансервавая), металаапр., суднабуд., тэкст.,

Горад **Сант'яга**. Раён Сан-Борха.

Сант'яга. Прэзідэнцкі палац Ла Манеда.

дывія як форт для абароны ад нападаў індзейцаў. У 1647 горад разбураны землетрасеннем. Пасля адбудовы да канца 18 ст. тут размяшчалася рэзідэнцыя іісп. каланіяльных улад. У 1738 у С. засн. ун-т. У 1810 адбылося нац.-вызв. паўстанне, задушанае іісп. войскадоў, асабнякоў т.зв. каліфарнійскага стылю сярэдзіны 20 ст. Сярод помнікаў: кляштар Сан-Франсіска з касцёлам (1572—1618; партал з матывамі рэнесансу і платэрэскі; вежа 1756, арх. П. дэ Мадар'я, перабудавана ў 1860, арх. Ф.Вівасета), класіцыстычныя прэзідэнцкі палац Ла Манеда (б. манетны двор; 1780—1805, арх. Таэска-і-Рычы, А.Кабальера), шпіталь Сан-Хуан дэ Дзьёс (1797, арх. Таэска-і-Рычы). На працягу 19 ст. класіцызм перарос у лацінаамер. варыянт. гістарызму і эклектызму: будынкі Нац. кангрэса (1-я пал. 19 ст., арх. А.К.Монт, з 1876 арх. Л.Эно, Э.Келі), ун-та Чылі (1854—74, арх. Эно, Вівасета), муніцыпальнага т-ра (1853, арх. К.Ф.Бруне дэ Бен, зруйнаваны ў 1870; новы будынак 1873, арх. Келі). У духу неаготыкі — саборы Ла Кампанья (перабудова), Эль Асіла дэль Сальвадор (арх. Х.Т.Гандарыльяс). Асобныя будынкі маюць выразныя рысы мадэрна: палацы трыбуналаў (1905—11, арх. Э.Дуаер, А.Шадэ), прыгожых мастацтваў (1910) і інш. Сярод значных збудаванняў 20 ст.: Мін-ва сац. забеспячэння (1930-я г., арх. Р.Гансалес Картэс), Эканам. камісія ААН для краін Лац. Амерыкі (1960—66, арх. Э.Дуарт), жылыя комплексы «Гансалес Картэс» (1960—63, арх. С.Гансалес і інш.), тэхнал. ун-т (1962—65, арх. К.Брэшані, Г.Вальдэс і інш.).

Я.Ф.Шунейка (архітэктура).



А.**Сант-Элія**. «Горад будучага». Малюнак. 1914.

САНТ'ЯГА (Santiago), Сант'яга-дэ-лос-Кабальерас, горад на Пн Дамініканскай Рэспублікі, на р. Якедэль-Нортэ. Адм. ц. аднайм. правінцыі. Засн. ў 1495 Б. Калумбам, братам Х.Калумба. 1539 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Другі па эканам. значэнні горад краіны. Прам-сць: тытунёвая, цукр., хімічная, апрацоўка кавы і какава (вытв-сць шакаладу). Гандл. цэнтр. с.-г. раёна (тыгарбарна-абутковая, буд. матэрыялаў. Паблізу нафтаперапр. з-д. Ун-т. Нац. гіст. музей.

Засн. ў 1514 іспанцамі як перадавы порт для зававання Мексікі і Цэнтр. Амерыкі. У 1522 атрымаў гар. правы. У 1553 разбураны франц. піратамі, у 1662 — англ. войскамі. Горад неаднаразова зруйнаваны землетрасеннямі (1675, 1766, 1852, 1932). Каля С.-дэ-К. адбылася вырашальная марская бітва ў *Іспанаамерыканскай вайне 1898*.

САНФІ́РАВА Вольга Аляксандраўна (2.5.1917, г. Самара, Расія — 13.12.1944), удзельніца баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1945). Скончыла Батайскую ваен. авіяшколу (1942). На фронце з мая 1942. Камандзір эскадрыллі 46-га Таманскага начнога лёгкабамбардзіровачнага жаночага авіяпалка. Капітан С. ў час *Беларускай аперацыі 1944* бамбіла тэхніку праціўніка каля Магілёва, Гродна, на пераправе цераз р. Пціч. На яе рахунку 630 баявых вылетаў. Пры вяртанні з баявога задання яе самалёт падбіты, загінула на мінным полі. У Гродне яе імем названа вуліца.

САН-ФРАНСІ́СКУ (São Francisco), рака ў Бразіліі, на Бразільскім пласкагор'і. Даўж. 2800 км, пл. бас. каля 600 тыс. км^2. Вытокі ў горным масіве Сера-да-Канастра, у вярхоўях мае горны характар, потым цячэ ў шырокай даліне тэктанічнага паходжання. У ніжнім цячэнні прарываецца цераз берагавы ўступ пласкагор'я да Атл. ак., утварае парогі і вадаспады Паўлу-Афонсу. Высокія ўзроўні вады ў

ліст. — маі. Сярэдні расход вады ў вусці 3300 м³/с. Буйное вадасх. Трэс-Марыяс і ГЭС (у верхнім цячэнні), некалькі ГЭС на вадаспадах Паўлу-Афонсу (у ніжнім). Суднаходная ў сярэднім цячэнні і ад вадаспадаў да вусця.

САН-ФРАНЦЫ́СКА (San Francisco), заліў Ціхага ак. каля берагоў Паўн. Амерыкі (ЗША). Злучаецца з акіянам пралівам *Залатыя Вароты*. Даўж. 88 км, шыр. 20 км. Б.ч. бухты мелкаводная, найб. глыб. 19 м. Упадаюць рэкі Сакраменто, Сан-Хаакін. На зах. беразе — г. Сан-Францыска, на ўсх. — гарады Окленд, Берклі, Рычманд. Берагі заліва злучаны мастамі, у т.л. адным з найдаўжэйшых у свеце — 14,4 км.

САН-ФРАНЦЫ́СКА (San Francisco), горад на З ЗША, на ўзбярэжжы Ціхага ак., у штаце Каліфорнія. Знаходзіцца на ўзгорыстым п-ве, масты цераз зал. Сан-Францыска і праліў Залатыя Вароты злучаюць яго з прыгарадамі. 745,8 тыс. ж., з прыгарадамі і суседнімі гарадамі (Окленд, Берклі, Аламеда, Дэйлі-Сіці, Саўт-Сан-Францыска і інш.) больш за 6,5 млн. ж. (2000). Буйнейшы порт ЗША на Ціхім ак., вузел трансканты-нент. чыгунак і аўтадарог. 3 аэрапорты, у т.л. міжнародны. Прам-сць: металапр., суднабуд., швейная, харч., паліграфічная; у прыгарадах — ракетна-касм., радыёэлектронная, нафтаперапр., хім., металургічная. Праўленні буйнейшых банкаў і кампаній ЗША. Метрапалітэн. 16 ун-таў і каледжаў. Кансерваторыя. Ваенна-марская база.

У 1776 на месцы сучаснага С.-Ф. іспанскія францысканцы засн. ўмацаванае паселішча Ерба-Буэна. З 1822 у складзе незалежнай Мексікі. У 1846 заняты амер. войскамі, перайменаваны ў С.-Ф. (1847). Адкрыццё ў 1848 радовішчаў золата ў Каліфорніі, развіццё ціхаакіянскага гандлю садзейнічала хуткаму развіццю горада (у 1848 — 500 чал., у 1850 — 25 тыс. чал., у 1880 — 234 тыс. чал.). У 1906 горад моцна пацярпеў ад землетрасення і пажару, да 1915 адбудаваны. Месца правядзення *Сан-Францыскай канферэнцыі 1945* і падпісання *Сан-Францыскага мірнага дагавора 1951*.

У 19 ст. С.-Ф. атрымаў прамавугольную планіроўку. Пасля землетрасення 1906 горад амаль цалкам перабудаваны. Узгорысты рэльеф і разнастайнасць арх. стыляў надаюць яму своеасаблівае, маляўнічае аблічча. Захаваліся іспан. калан. пабудовы, у т.л. касцёл кляштара «Місія Далорэс» (1782—91). Малапавярховая забудова, скучаныя нац. кварталы («Кіт. горад», «Лац. квартал») спалучаюцца з вышынными будынкамі цэнтра. Найб. значныя пабудовы: паромны вакзал (1896), грамадскі цэнтр (1910—20), Палац прыгожых мастацтваў (1915, арх. Б.Мейбек), шпіталь Майманіда (1946, арх. Э.Мендэльзон), магазін В.Морыса (1948, арх. Ф.Л.Райт), дом страхавой кампаніі Дж.Хэнкака (1959, арх. фірма «СОМ»), небаскробы «Банк Амерыкі», «Трансамерыка карпарэйшэн», «Міжнар. будынак», гасцініца «Холідэй-ін», жылы комплекс Голдэн-Гейтуэй (усе 1950—70-я г.). Магутныя інж. збудаванні, што звязваюць ч. гар. агламерацыі — вісячыя масты: 2-секцыйны Окленд цераз заліў Сан-Францыска (1936, даўж. каля 13 км), цераз праліў Залатыя вароты (1937, даўж. сярэдняга пралёту 1280 м). Музеі: мастацтва, Цэнтр мастацтва і культуры Азіі, Каліфарнійскі палац Ганаровага легіёна (Музей прыгожых мастацтваў) і інш. Т-ры: Опера, «Спрынг-опера» і інш.



Дзелавая частка г. **Сан-Францыска**.

Панарама г. **Сан-Францыска**.

Мост праз праліў Залатыя вароты ў г. **Сан-Францыска**.

САН-ФРАНЦЫ́СКАЯ КАНФЕРЭ́НЦЫЯ 1945, устаноўчая канферэнцыя 50 дзяржаў па заснаванні *Арганізацыі Аб'яднаных Нацый*. Адбылася 25.4—26.6.1945 у г. *Сан-Францыска* (ЗША). Склікана паводле рашэння *Крымскай канферэнцыі 1945* аб стварэнні ўсеагульнай міжнар. арг-цыі для падтрымання міру і бяспекі. Запрашэнні на С.-Ф.к. накіраваны ад імя ўрадаў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Кітая ўрадам 42 дзяржаў, якія падпісалі *Дэкларацыю Аб'яднаных Нацый* ад 1.1.1942 ці далучыліся да яе потым і абвясцілі вайну краінам фаш. блока да 1.3.1945. Адсутнасць сярод запрошаных БССР і УССР стала прадметам рознагалоссяў паміж СССР і яго зах. саюзнікамі (ЗША і Вялікабрытаніяй). Пад націскам нар. камісара замежных спраў СССР В.М.Молатава зах. дзяржавы пагадзіліся з сав. патрабаваннем. 27.4.1945 на 1-м пасяджэнні кіраўнікоў дэлегацый (Кіруючага к-та) па прапанове кіраўніка дэлегацыі СССР Молатава ў парадак дня С.-Ф.к. аднагалосна ўключана пытанне пра запрашэнне БССР і УССР. Пасля падтрымкі сав. прапановы кіраўнікамі дэлегацый ЗША, Вялікабрытаніі, Кітая, Францыі, Бразіліі, Чэхаславакіі і Аўстраліі канферэнцыя аднагалосна (47 галасамі) прыняла пастанову пра ўключэнне БССР і УССР у лік першапачатковых членаў арг-цыі. 30.4.1945 пленарнае пасяджэнне С.-Ф.к. зноў аднагалосна прыняло рашэнне пра запрашэнне дэлегацый БССР і УССР. У той жа дзень на канферэнцыю запрошаны ўрад Аргенціны, а 5.6.1945 — Данніі. Па патрабаванні дэлегацыі СССР С.-Ф.к. вырашыла лічыць членам-заснавальнікам ААН і Польшчу (падпісала Статут ААН у канцы 1945). 1.5.1945 ген. сакратар канферэнцыі А.Хіс паслаў з Вашынгтона ў Мінск запрашальную тэлеграму наркому замежных спраў БССР К.В.*Кісялёву*.

30.4.1945 Прэзідыум Вярх. Савета БССР прызначыў бел. дэлегацыю ў складзе Кісялёва (кіраўнік), Г.І.Байдакова, А.Р.Жэбрака, У.М.Перцава, Ф.П.Шмыгава; у тэхн. персанал дэлегацыі ўвайшлі В.І.Фармашаў (кансультант), М.Ц.Лынькоў (карэспандэнт), М.І.Пятрова (перакладчыца), Несцерава (перакладчыца-стэнаграфістка). 8.5.1945 дэлегацыя БССР пачала працу і ўнесла ўклад у распрацоўку Статута ААН. Яго выпрацоўка ажыццяўлялася на падставе прапаноў *Думбартан-Окс канферэнцыі 1944*,

палажэнняў аб працэдуры галасавання ў *Савеце Бяспекі ААН*, узгодненых на Крымскай канферэнцыі («ялцінская формула»), дапаўненняў і паправак, прадстаўленых дзяржавамі — удзельніцамі С.-Ф.к. Дэлегацыя БССР выступала за права аднагалосся (вета) пастаянных членаў Савета Бяспекі, уключэнне ў Статут ААН палажэнняў аб самавызначэнні народаў, забеспячэнні інтарэсаў калан. і залежных краін і інш. Па гэтых пытаннях у Статут унесены палажэнні, якія захоўвалі «ялцінскую формулу», уключалі СССР у склад Савета па апецы і закладалі палітыка-прававую аснову для антыкалан. дзейнасці, адкрывалі шлях у ААН толькі міралюбным дзяржавам. Было выпрацавана палажэнне, што *Генеральная Асамблея ААН* можа абмяркоўваць усе пытанні ў межах Статута ААН. 23.5.1945 на першай з часу стварэння ў 1919 Наркамата замежных спраў БССР прэс-канферэнцыі нарком замежных спраў Беларусі Кісялёў заявіў, што БССР будзе праводзіць самаст. знешнюю палітыку, якая ва ўсіх прынцыповых пытаннях супадае з пазіцыяй СССР. 26.6.1945 прадстаўнікі 50 дзяржаў, у т.л. БССР, падпісалі Статут ААН, Статут *Міжнароднага суда ААН* і Часовае пагадненне аб стварэнні Падрыхтоўчай камісіі. Апошняй належала ажыццявіць мерапрыемствы, звязаныя з пачаткам дзейнасці гал. органаў ААН (Ген. Асамблеі, Савета Бяспекі і інш.). 30.8.1945 Прэзідыум Вярх. Савета БССР ратыфікаваў Статут ААН. 24.10.1945 ён набыў сілу. С.-Ф.к. — першы міжнар. форум 20 ст., у якім дэлегацыя Беларусі ўдзельнічала на раўнапраўнай і прававоцнай аснове.

Літ.: Снапковский В.Е. Путь Беларуси в ООН, 1944—1945 гг. Мн., 1994; Яго ж. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі, 1944—1953 гг. Мн., 1997. *У.Е.Снапкоўскі.*

САН-ФРАНЦЫ́СКІ МІ́РНЫ ДАГАВО́Р 1951, дагавор з Японіяй пасля 2-й сусв. вайны. Падпісаны 8 вер. на міжнар. мірнай канферэнцыі (праходзіла 4—8.9.1951; склікана ЗША і Вялікабрытаніяй) у г. *Сан-Францыска* (ЗША) прадстаўнікамі 49 з 52 дзяржаў-удзельніц. Не падпісалі дагавор СССР (дэлегацыю ўзначальваў А.А.*Грамыка*), Польшча і Чэхаславакія, прадстаўнікі Кіт. Нар. Рэспублікі і Тайваня не былі запрошаны, Індыя і Бірма адмовіліся ад удзелу ў канферэнцыі. Падрыхтаваны ўрадамі ЗША і Вялікабрытаніі на працягу лют. 1946 — жн. 1951. Складаўся з 7 раздзелаў (27 артыкулаў). Спыніў стан вайны паміж Японіяй і ўдзельнікамі дагавора. Японія прызнавала незалежнасць Карэі і рашэнні Савета Бяспекі ААН пра былыя падмандатныя яп. тэр., адмаўлялася ад прэтэнзій на Курыльскія а-вы, Паўд. Сахалін, в-аў Тайвань, а-вы Пэнхуледао, Спратлі і Парасельскія. Дэкларавў спыненне амер. акупац. рэжыму ў Японіі, але амер. войскі заставаліся ў краіне на няпэўны тэрмін. 8 вер. ў Сан-Францыска дзярж. сакратар ЗША Д.Ачэсан і прэм'ер-міністр Японіі Ёсіда Сігэру падпісалі таксама двухбаковы «дагавор бяспекі» (гл. ў арт. *Амерыкана-японскія дагаворы 1951, 1960*). Абодва дагаворы набылі сілу 28.4.1952. С.-ф.м.д. 1951 не вырашыў праблему тэр. размежавання паміж Японіяй і СССР і пытанні нармалізацыі адносін Японіі з Кіт. Нар. Рэспублікай.

САН-ХАСЭ́ (San José), горад, сталіца Коста-Рыкі. Знаходзіцца на міжгорным вулканічным плато на выш. каля 1100 м, паблізу дзеючых вулканаў Ірасу і Поас. Каля 1,3 млн. ж. з прыгарадамі (2000). На Панамерыканскай шашы, вузел аўтадарог, чыг. станцыя. Міжнар. аэрапорт. Паліт., культ. і прамысл. цэнтр краіны. Прам-сць: харч., металаапр., гарбарна-абутковая, тэкст., тытунёвая. 2 ун-ты. Акадэмія гісторыі і мовы. Нац. тэатр. Музеі: Нац., Туземны. Арх. помнікі калан. перыяду. Частыя землетрасенні.

Засн. ў 1738 іспанцамі. У 1755 сюды прымусова перасялілі жыхароў далін Асеры і Эрэдыя. У 1813 атрымаў гар. правы. У 2-й пал. 18 ст. ў сувязі з ростам плантацый тытуню стаў цэнтрам тытунёвай вытв-сці. З 1823 сталіца Коста-Рыкі (разам з г. Картага, амаль поўнасцю разбураным вывяржэннем вулкана Ірасу).

САН-ХАСЭ́, Сан-Хазэ (San Jose), горад на З ЗША, у штаце Каліфорнія. Засн. ў 1777. 871,3 тыс. ж., з прыгарадамі больш за 1,5 млн. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Буйны цэнтр ракетна-касм. і радыёэлектроннай прам-сці. Развіта таксама вытв-сць ЭВМ, паўправадніковых прылад, ваен. абсталявання, кансерваваных фруктаў і віна. Машынабудаванне і аўтазборка. 3 ун-ты.

САН-ХУА́Н (San Juan), горад, адм. ц. Пуэрта-Рыка, на паўн. узбярэжжы в-ва Пуэрта-Рыка. Засн. ў 1508 пад назвай Капара. 439,6 тыс. ж., з прыгарадамі больш за 1 млн. ж. (1999). Гал. марскі порт краіны, вузел аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Эканам. і культ. цэнтр краіны. Прам-сць: харчасмакавая (цукровая, тытунёвая), гарбарна-абутковая, тэкст., швейная, нафтаперапр., хімічная. Ун-ты. Музеі. Гіст. парк руін Капара (16 ст.). Арх. помнікі 16—17 ст. (умацаванні і будынкі).

САН-ХУА́Н (San Juan), горад на З Аргенціны, на р. Сан-Хуан. Адм. ц. аднайм. правінцыі. Засн. ў 1562. Каля 350 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: харчасмакавая, у т.л. вінаробства, перапрацоўка агародніны і фруктаў; маш.-буд., цэментная. Цэнтр буйнога раёна вінаградарства і агародніцтва. Ун-т. Неаднойчы быў разбураны землетрасеннямі.

САНЬГО́, Трохцарства, перыяд у гісторыі Кітая (220—265 або 220—280), калі пасля распаду імперыі *Хань* ён быў падзелены на тры царствы (Вэй, У і Шу), якія вялі паміж сабой бясконцыя войны за гегемонію над усёй краінай. Напачатку дамінавала царства Шу, але ў 263 знясіленае ўнутр. барацьбой яно было заваявана царствам Вэй. У 265 уладу ў царстве Вэй захапіў палкаводзец Сыма Янь, які заснаваў дынастыю *Цзінь* [265—420], а ў 280 канчаткова заваяваў царства У. Перыяд С. адлюстраваны ў гіст. рамане 14 ст. «Апавяданні з гісторыі Трохцарства».

САНЬЦЗЯ́Н, Сунгарыйская раўніна, нізіна на ПнУ Кітая, паміж р. Амур і ніжнім цячэннем р. Усуры. На С. знаходзіцца таксама нізоўі р. Сунгары. Размешчана ў тэктанічным прагіне, які запоўнены алювіем. Даўж. каля 400 км, шыр. 120—160 км, выш. каля 100 м, астраўныя горы, выш. да 627 м. У час летніх паводак значная тэр. заліваецца вадой. Балоты, хвойныя і шыракалістыя лясы, т.зв. усурыйская тайга, участкі лугавых стэпаў.

САП, другая назва воз. *Танлесап* у Камбоджы.

САП, вострая інфекцыйная хвароба жывёл і чалавека са з'явамі інтаксікацыі і ўтварэннем спецыфічных гранулём. Узбуджальнік — палачкападобная бактэрыя псеўдамонас хворых жывёл (коні, аслы, мулы і інш.). Чалавек часцей заражаецца ад хворых на С. коней праз пашкоджаныя скуру, слізістыя абалонкі. С. бывае востры і хранічны. На месцы пранікнення ўтвараецца чырвона-барвовая папула, потым пухірок (пустула), які разбураецца з утварэннем язвы. Прыкметы С.: высокая т-ра цела (да 40,5 °С), галаўны і мышачны боль, прыпухласць у вобласці суставаў, на скуры множныя вузельчыкі і папулы. Абсцэсы ўтвараюцца таксама ў мышцах (асабліва ікраножных), лёгкіх, печані, селязёнцы, суставах, касцях з далейшым фарміраваннем свішчоў. Лячэнне тэрапеўт., хірургічнае. Хворых жывёл знішчаюць. *А.А.Астапаў.*

САП НЕСАПРА́ЎДНЫ, тое, што *меліяідоз*.

САПАНА́РЫЯ, род кветкавых раслін, тое, што *мыльнік*.

САПАНІ́НЫ, арганічныя безазоцістыя рэчывы, у якіх цукры злучаны з вытворнымі стэрынаў. Утрымліваюцца гал. чынам у раслінах, знойдзены таксама ў тканках ігласкурых.

Аморфныя, бясколерныя ці жаўтаватыя рэчывы, добра растваральныя ў вадзе (растворы пенящца, як мыла). Уваходзяць у састаў лек. прэпаратаў расл. паходжання (напр., кара мыльнага дрэва, салодка), якія ўжываюцца як адхаркавальная і мачагонныя сродкі. Некат. С. выкарыстоўваюцца ў вытв-сці стэроідных гармонаў.

САПАНІ́Т [ад лац. sapo (saponis) мыла], мыльны камень, мінерал падкласа слаістых сілікатаў, групы *мантмарыланіту*. Хім. састаў $NaMg_3[AlSi_3O_{10}](OH)_2 \cdot 4H_2O$. Крышталізуецца ў манаклінай сінганіі. Колер белы, жаўтаваты, чырванаваты. Цв. С. (сухога) 2,5 шчыльн. 2,24—2,3 г/см^3. У вільготным стане скопішчы мяккія і тлустыя, у сухім шчыльныя,

крохкія. Утвараецца пры выветрыванні цёмнакаляровых (магніевых) мінералаў ультраасноўных парод (серпентынітаў). Валодае якасцямі *бентанітаў*. Трапляецца ў зямлістых глінападобных або шчыльных скрытакрышт. масах. Гл. таксама *Адбельныя гліны*.

САПА́РА, горад у Японіі, на ПдЗ в-ва Хакайда паблізу Японскага м. Адм., эканам. і культ. цэнтр вострава. Засн. каля 1871. Каля 2 млн. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог, паблізу марскі порт Атару. Аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд. (у т.л. авіябудаванне), тэкст. (выт-сць ільняных і пяньковых вырабаў), нафтаперапр., нафтахім., гумавая, фармацэўтычная, гарбарна-абутковая, лесапільная і дрэваапр., харчасмакавая (піва, рыбныя кансервы), паліграфічная. Метрапалітэн. 4 ун-ты, у т.л. ун-т Хакайда, пры якім дзейнічае Ін-т славістыкі з багатым кнігазборам. Бат. сад, бат. і этнагр. музеі. Паркі Накадзіма і Маруяма. Цэнтр. зімовага спорту. У С. адбыліся XI зімовыя Алімп. гульні (1972).

САПАСНЁВІЧ, жывапісец 2-й пал. 17 — 1-й пал. 18 ст. Працаваў на Беларусі. Аўтар алтарнага абраза «Св. Іосіф з дзіцем» (1701). *М.М.Яніцкая.*

САПА́ТА (Zapata) Эміліяна (8.8.1879, Аненекуілька, Мексіка — 10.4.1919), адзін з кіраўнікоў *Мексіканскай рэвалюцыі 1910—17*. Удзельнік і кіраўнік барацьбы сялян раёна Куаутлы за сваю зямлю супраць латыфундыстаў. З пач. рэвалюцыі выступіў на баку Ф.І.*Мадэра* супраць дыктатуры П.*Дыяса*, стварыў сял. армію, якая дзейнічала на Пд ад г. Мехіка. Калі Мадэра выявіў няздольнасць вырашыць агр. пытанне, С. прапанаваў сваю агр. праграму (т.зв. «план Аяла»), якая прадугледжвала канфіскацыю зямель латыфундыстаў і іх размеркаванне сярод беззямельных сялян. У 1913—14 на чале Вызваленчай арміі Поўдня змагаўся супраць дыктатуры В.Уэрты. Пасля таго як Уэрта быў скінуты (ліп. 1914), сумесна з Ф.*Вільля* выступіў супраць прэзідэнта В.Карансы, які марудзіў з вырашэннем зямельнага пытання. Іх атрады занялі г. Мехіка (снеж. 1914 — студз. 1915), але былі вымушаны пакінуць яго. Забіты адным з паплечнікаў. Імя С. носіць леварадыкальны паўстанцкі рух у мексіканскім штаце Ч'япас, які з сярэдзіны 1990-х г. вядзе ўзбр. барацьбу за правы індзейцаў.

САПАТЭ́КІ, індзейскі народ, які жыве ў Мексіцы. У 1990-я г. каля 380 тыс. чал. Мова С. належыць да атаміштэкасапатэцкіх моў. Паводле веравызнання С. фармальна католікі, але захоўваюць шматлікія элементы традыц. вераванняў. Асн. заняткі — с.-г. праца, рамяство, у т.л. выт-сць сувеніраў для турыстаў. С. стварылі высокую своеасаблівую культуру, самыя стараж. помнікі якой датуюцца 10 ст. да н.э. Росквіт адбываўся ў 2—5 ст. н.э. С. будавалі храмы на пірамідальных асновах, палацы, збудаванні для рытуальнай гульні ў мяч, «абсерваторыі» для астр. назіранняў. Цікавыя скляпы — закапаныя ў зямлю будынкі з багата ўпрыгожанымі фасадамі. Рэльефы адлюстроўваюць гратэскавыя фігуры «танцораў» (8—4 ст. да н.э.), пазней — божастваў, правіцеляў, жрацоў, палонных і інш. На фігурных керамічных пасудзінах адлюстраваны фігуры з партрэтнымі тварамі, у складаных галаўных уборах ці шлемах. Са з'яўленнем еўрапейцаў у Амерыцы культура С. была практычна знішчана.

САПЕ́ГА Васіль Іванавіч (н. 4.10.1937, в. Петрацінка Навазыбкаўскага р-на Бранскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р с.-г. н. (1994), праф. (1966). Скончыў Віцебскія вет. (1963) і пед. (1966) ін-ты. З 1979 у Бел. агр. тэхн. ун-це (заг. кафедры). Навук. працы па выкарыстанні біялагічна-актыўных рэчываў у жывёлагадоўлі, пытаннях гігіены с.-г. жывёл.

Тв.: Контроль параметров технологических процессов в животноводстве. М., 1985 (у сааўт.); Основы животноводства. Мн., 1997 (у сааўт.); Пути снижения энергозатрат в скотоводстве. Мн., 1998 (у сааўт.);

САПЕ́ГА Леў Іванавіч (4.4.1557, в. Астроўна Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл. — 7.7.1633), бел. дзяржаўны дзеяч ВКЛ. З магнацкага роду *Сапегаў*. Пісар вялікі ВКЛ у 1581—85, падканцлер у 1585—89, канцлер у 1589—1623, ваявода віленскі з 1623 і адначасова гетман вялікі з 1625. Вучыўся ў кальвінісцкіх настаўнікаў у Нясвіжы, у 1570—73 у Лейпцыгскім ун-це, дзе перайшоў у кальвінізм. У 1579—81 прымаў удзел у Лівонскай вайне 1558—83. Разам з канцлерам А.Б.*Валовічам* і падканцлерам К.*Радзівілам* удзельнічаў у стварэнні *Трыбунала Вялікага княства Літоўскага*. У 1584 падпісаў у Маскве пагадненне аб перамір'і. У 1586 перайшоў у каталіцтва. У час бескаралеўя ў 1587 прапанаваў план федэрацыі Польшчы, ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы з адным каралём, якім прапаноўваўся цар Фёдар Іванавіч. Калі гэты план не быў рэалізаваны, падтрымаў кандыдатуру Жыгімонта III Вазы. Узначальваў соймавую камісію па падрыхтоўцы *Статута Вялікага княства Літоўскага 1588*, адрэдагаваў яго тэкст і фінансаваў яго выданне ў віленскай друкарні Мамонічаў. На царк. саборы ў Брэсце ў 1596 як каралеўскі камісар выступіў у абарону царк. уніі. Паводле яго загаду ў 1594—1607 былі нанава перапісаны кнігі *Метрыкі Вялікага княства Літоўскага*, каб пры карыстанні яны не прыходзілі ў непрыгоднасць (новыя кнігі збяруцца да нашага часу). У 1600—01 узначальваў пасольства ў Маскву, у выніку якога перамір'е працягнута яшчэ на 20 гадоў. С. не падтрымаў Ілжэдзмітрыя I, бо лічыў за лепшае заключыць унію з Маскоўскай дзяржавай. У 1609, пераканаўшыся, што унія з Масквой не адбудзецца, выступіў за *вайну Рэчы Паспалітай з Расіяй 1609—18* і падтрымаў Ілжэдзмітрыя II. У *1617—18* садзейнічаў арганізацыі і фінансаванню паходу каралевіча Уладзіслава на Маскву. Удзельнічаў у перагаворах з маскоўскімі пасламі, у выніку чаго падпісана *Дэулінскае перамір'е 1618*. Пасля забойства уніяцкага полацкага архіепіскапа Іасафата *Кунцэвіча* віцебскімі праваслаўнымі мяшчанамі ў 1623 С. ўзначаліў судовую камісію, якая вынесла суровыя пакаранні ўдзельнікам забойства. У 1625 удзельнічаў у *вайне Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1600—29* на чале дывізіі ў Інфлянтах. У сваёй палітыцы адстойваў суверэнітэт ВКЛ у складзе федэратыўнай Рэчы Паспалітай, няўхільна прытрымліваўся 12-га

Л.І.**Сапега**. Партрэт 17 ст.

артыкула 3-га раздзела Статута ВКЛ 1588, які забараняў раздаваць польскай шляхце маёнткі і займаць ёй дзярж. пасады ў ВКЛ.

Літ.: Саверчанка І.В. Канцлер Вялікага Княства: Леў Сапега. Мн., 1992.

А.П.Грыцкевіч.

САПЕ́ГА Ян Казімір (? — 22.2.1730), дзяржаўны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай і Рас. імперыі. Ген.-фельдмаршал рас. службы (1726). З роду *Сапегаў*. Вучыўся ў езуіцкіх калегіумах Варшавы (да 1685) і Брунсберга (Бранева, 1692). З 1682 староста бабруйскі, з 1697 пасол (дэпутат) сойма ад Брэсцкага ваяв. Удзельнік Паўночнай вайны 1700—21. У 1702 далучыўся да войска караля Рэчы Паспалітай *Аўгуста II*, але неўзабаве перайшоў на бок шведаў. Адзін з ініцыятараў Варшаўскай канфедэрацыі 1704, створанай для дэтранізацыі Аўгуста II і абрання каралём *Станіслава Ляшчынскага*. Атрымаў шэраг перамог над войскамі Аўгуста II, у т.л. каля Пултуска (1704), Ляхавічаў (1709), удзельнік няўдалай бітвы каля Каліша (1706), 13.5.1709 разбіты рус. войскамі каля Лядухава (Украіна). У 1708—09 вял. гетман літоўскі (прызначаны шведскім каралём Карлам XII). Пасля паражэння

шведаў у *Палтаўскай бітве 1709* перайшоў на бок рускіх і Аўгуста II і дамогся для сябе амністыі. Аднак страціўшы пасаду гетмана, з канца 1709 з мэтай вяртання гетманскай булавы зноў павёў барацьбу (у 1711—13 узброеную) супраць Аўгуста II. У 1713 зноў перайшоў на яго бок і атрымаў амністыю. Выношваў план захопу Карла XII у час яго праезду праз Польшчу з Бендэр (Малдова) у Памор'е і выдачы яго аднаму з кіраўнікоў *Сандамірскай канфедэрацыі 1704* вял. кароннаму гетману А.Сяняўскаму. Але пасля няўдачы гэтай аперацыі быў сам арыштаваны прыхільнікамі Аўгуста II і аддадзены пад суд гетманаў; вызвалены праз заступніцтва

Ян Казімір **Сапега**. Гравюра 18 ст.

крымскага хана Дэўлет-Гірэя. У 1720 разарваў адносіны з Аўгустам II. Намерваўся ажаніць свайго сына Пятра з Марыяй — дачкой рас. князя А.Д.Меншыкава, які хацеў з дапамогай С. атрымаць Курляндскае і Земгальскае герцагствы (заручыны адбыліся вясной 1726 у Пецярбургу, падарожжа С. ў рас. сталіцу апісана ў яго дзённіку). Аднак планы Меншыкава і С. не здзейсніліся, і пасля скасавання заручын іх адносіны пагоршыліся. Тым не менш С. застаўся пры двары *Кацярыны I* і захаваў свае пазіцыі пры Пятру II [1727—30]. Удзельнічаў у рабоце вышэйшых дзярж. устаноў Расіі. Пасля ссылкі Меншыкава (1727) ген.-губернатар Пецярбурга і Інгрыі. Вясной 1728 выехаў у ВКЛ, каб умацаваць пазіцыі Сапегаў у дзяржаве, але беспаспяхова.

Літ.: Артамонов В.А. Россия и Речь Посполитая после Полтавской победы (1709—1714). М., 1990; Kriegseisen W. Diariusz petersburgskiej podróży Jana i Piotra Sapiehów z 1726 r. Warszawa, 1993.

А.М.Лукашэвіч.

САПЕ́ГАЎ БІБЛІЯТЭ́КІ. Існавалі ў 16 — пач. 19 ст. у Слоніме, Ружанах (Пружанскі р-н), Дзярэчыне (Зэльвенскі р-н), Кодані (цяпер Польшча). Другі па велічыні прыватны кнігазбор на Беларусі (пасля б-к Радзівілаў). Пачатак кнігазбору дала ружанская б-ка канцлера вял. літоўскага Л.*Сапегі*, якую павялічыў яго сын Казімір Леў. У 18 ст. ружанскі збор перавезены ў Дзярэчын і значна папоўнены Аляксандрам, Міхалам, Францыскам Сапегамі. Б-ка ў Кодані вырасла дзякуючы бібліяфільству канцлера вял. літоўскага Яна Фрыдэрыка і Аляксандра Сапегаў. У ёй найб. поўна прадстаўлена л-ра па юрыспрудэнцыі, гісторыі, паэзіі, мовазнаўстве, геаграфіі, тэалогіі. Акрамя кнігазбору ў ёй былі архіў стараж. актаў, калекцыя гравюр. У 1644—45 вял. колькасць кніг К.Л.Сапега ахвяраваў б-цы Віленскай езуіцкай акадэміі. У 1810 А.Сапега перадаў коданскую б-ку варшаўскаму Т-ву аматараў навук. Дзярэчынская б-ка і архіў у 1834 вывезены ў С.-Пецярбург. Захаваліся вопісы на асобныя часткі С.б., экслібрысы некат. уладальнікаў кнігазбору. Большая частка С.б. зберагаецца ў Расійскай нац. б-цы (С.-Пецярбург), б-цы Вільнюскага ун-та, рэшта — у б-цы Расійскай АН (С.-Пецярбург), б-цы Варшаўскага ун-та і інш. кнігасховішчах.

Літ.: Иконников В.С. Опыт русской историографии. Киев, 1891. Т. 1, кн. 1. С. 784; Кн. 2. 1892. С. 1237—1238; Нікалаеў М. Аблічча сярэдневяковай бібліятэкі: Кнігазборы Сапегаў // Мастацтва Беларусі. 1985. № 7.

М.В.Нікалаеў.

САПЕ́ГАЎ ТЭА́ТР У ДЗЯРЭ́ЧЫНЕ. Існаваў у 1786—91 у в. Дзярэчын Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл. Праект т-ра быў створаны Я.С.Бекерам. Будынак быў крыжападобны ў плане, разлічаны на драўляныя канструкцыі, меў сцэну з чатырма планамі куліс і заднікам. Зала мела 7 радоў у партэры і 9 лож. Аўтарам дэкарацый да спектакляў таксама быў Бекер. У т-ры працавала



Праект **Сапегаў тэатра ў Дзярэчыне**. Арх. Я.С.Бекер. 1780-я г.

капэла. Для т-ра мастак К.Атасельскі стварыў славутую заслону «Купанне Дыяны» (пасля 1776), якую пазней набыў антрэпрэнёр Д.Мараўскі для новага т-ра ў Вільні.

САПЕ́ГІ, буйны магнацкі род герба «Ліс» у ВКЛ, прадстаўнікі якога ў 15—18 ст. займалі вышэйшыя дзярж. і вайсковыя пасады; буйныя землеўладальнікі. Лічыўся другім па значэнні (пасля Радзівілаў) магнацкім родам ВКЛ. Беларусы па паходжанні, напачатку былі праваслаўнымі, у 2-й пал. 16 ст. частка іх далучылася да пратэстанцтва, аднак ужо ў канцы 16 ст. С. прынялі каталіцтва. У 17—18 ст. складаліся радаводы С., дзе сцвярджалася пра іх быццам бы княжацкае паходжанне ад Нарымонта, сына Гедзіміна. У 18—19 ст. некат. даследчыкі выводзілі С. ад трокскага кашталяна Сунігайлы, нібыта праўнука Нарымонта. А.Банецкі, Ю.Вольф і У.Сямковіч у сваіх даследаваннях даказалі, што С. паходзяць ад Сямёна Сапігі (Сапегі), велікакняжацкага пісара ў 1440-х г. з полацкіх баяр. Першапачаткова вял. маёнткі С. знаходзіліся ў Смаленскай зямлі: Ельня, Гарадзішча, Апакоў. У выніку *вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1500—03* С. страцілі Гарадзішча і Апакоў, якія адышлі да Масквы, а ў выніку *вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1512—22* страцілі і Ельню. У родапачынальніка Сямёна былі 4 сыны, з якіх Багдан і Іван сталі пачынальнікамі 2 гал. ліній роду — чарэйска-ружанскай і коданскай. Багдан (да 1450—пасля 1512) у выніку шлюбу з князёўнай Фядорай Друцкай-Сакалінскай атрымаў Чарэю і інш. маёнткі — ядро ўладанняў С. у Полацкім і Віцебскім ваяв. Іван (каля 1450—1517) атрымаў за службу маёнткі на Браслаўшчыне (Друю, Іказнь, Пагост), Кодань каля Брэста і інш. Старэйшая, чарэйска-ружанская лінія роду займала больш трывалыя пазіцыі ў дзярж. колах, малодшая мела меншае паліт. значэнне. У апошняй чвэрці 17 ст. род яшчэ больш узвысіўся. Кароль Ян III Сабескі, каб супрацьдзейнічаць магутнаму роду Пацаў, даваў вышэйшыя дзярж. пасады С., якія, умацаваўшы сваё становішча, выступілі супраць караля. У гэты час пашырылася незадаволенасць усеўладствам і злоўжываннямі С. У 1696 супраць іх пачалася адкрытая барацьба большай часткі шляхты ВКЛ. На сойме 1696 ёй удалося правесці канчатковае ўраўнаванне яе правоў з правамі польскай шляхты («каэквацыя»), у т.л. ў кантролі над дзейнасцю вышэйшых службовых асоб. І хоць сойм 1697 пацвердзіў «каэквацыю» і прымірыў абодва бакі, канфлікт паміж С. і шляхтай працягваўся. У 1700 ён набыў характар грамадзянскай вайны. 18.11.1700 пад Алькенікамі (на Пд ад Вільні, цяпер г. Вільнюс) адбылася рашучая бітва паміж ат-

радамі С. і шляхты. Войска С. было разбіта, самі яны пазбаўлены пасад, некат. з іх пакінулі краіну. У час *Паўночнай вайны 1700—21* С. сталі на бок шведскага караля Карла XII і падтрымлівалі шведскага стаўленіка караля *Станіслава Ляшчынскага*. Шляхта працягвала ваяваць супраць С. і заключыла з царом Пятром I дагавор аб рас. ваеннай і грашовай дапамозе. Тады С. пайшлі нават на стварэнне казацка-сялянскіх атрадаў на чале з Юрэвічам, Більдзюкевічам і Хмарай, якія дзейнічалі супраць шляхты ва ўсх. частцы Беларусі. У 1702 гэтыя атрады былі разбіты. У 1704 рас. армія ачысціла Беларусь ад шведскіх і сапегаўскіх атрадаў. Пасля Каралеўстве Польскім у 1822, у Аўстрыі ў 1840, у Расіі ў 1874. С. збіралі б-кі (гл. *Сапегаў бібліятэкі*), архівы, калекцыі твораў мастацтва, трымалі тэатры. За ўдзел некат. прадстаўнікоў роду С. у *паўстанні 1830—31* іх маёнткі ў Беларусі былі канфіскаваны царскім урадам. У 1915—18 С. прэтэндавалі на трон ВКЛ, якое меркавалася адрадзіць пасля магчымай перамогі Германіі ў 1-й сусв. вайне; С. мелі кантакты з нац. арг-цыямі на акупіраванай ням. войскамі тэр. Літвы і Беларусі, у т.л. з беларускімі. У 1918—39 у Польшчы С. — землеўладальнікі, дыпламаты, службоўцы. Пасля 2-й сусв. вайны ў эміграцыі.

Найб. вядомыя:

Багдан Сямёнавіч (да 1450 — пасля 1512), старэйшы сын Сямёна, заснавальнік чарэйска-ружанскай галіны роду. У 1471—88 пісар гаспадарскі (велікакняжацкі) Казіміра IV Ягелончыка. У 1494—1500 намеснік і дзяржаўца мцэнскі і любецкі, пасля акольнічы смаленскі, з 1503 намеснік высакадворскі. У 1504 і 1507 у складзе пасольстваў у Маскве, дзе ў 1507—08 быў зняволены як заложнік за сям'ю М.Глінскага.

Іван Сямёнавіч (Івашка Сапежыч; каля 1450—1517), 2-і сын Сямёна, пачынальнік коданскай галіны роду С. Пісар гаспадарскі Казіміра IV Ягелончыка з 1488. Пасол у Маскву ў 1497, 1498, 1499, у Рым у 1501, дзе дамогся ад папы зацвярджэння мітрапаліта Іосіфа I Балгарыновіча, там далучыўся да Фларэнційскай царк. уніі. З 1501 канцлер вял. княгіні *Алены Іванаўны*. У 1502 пасол да магістра Лівонскага ордэна, у 1503 — у Маскву, заключыў 6-гадовае перамір'е, якое скончыла вайну Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ 1500—03. Маршалак гаспадарскі з 1504. Пасля абрання на трон Жыгімонта I Старога (1506) тытулаваўся найвышэйшым сакратаром ВКЛ. У 1505 зноў пасол у Маскву, аднак прадоўжыць тэрмін перамір'я не ўдалося. Намеснік віцебскі ў 1508—14 (з 1511 ваявода). Пасол у Маскву ў 1508, заключыў мір, якім скончана *вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1507—08*. У 1512 вёў перагаворы ў Польшчы з кароннаю радаю аб дапамозе ў вайне Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1512—22. Удзельнічаў у кампаніі 1514 пад кіраўніцтвам гетмана К.Астрожскага. Ваявода падляшскі з 1514. Заклаў асновы латыфундыі коданскай лініі роду. У 1504 заснаваў мяст. Іказнь і Іказненскі замак, збудаваў мяст. Кодань з замкам (на левым беразе Буга каля Брэста).

Іван Багданавіч (каля 1480—1546), сын Багдана Сямёнавіча. Пісар гаспадарскі ў 1507—16, маршалак гаспадарскі ў 1515—41, ваявода віцебскі ў 1520—41 і падляшскі з 1529; староста драгічынскі ў 1529—41 і з 1545. Пасол у Маскву ў 1508, 1531—32, 1536, у Турцыю ў 1534.

Павел Іванавіч (каля 1490—1579), сын Івана Сямёнавіча. Вучыўся ў Кракаўскім ун-це. Дзяржаўца браслаўскі ў 1517—47, маршалак гаспадарскі ў 1519—57, ваявода падляшскі ў 1556—58 і навагрудскі з 1558. Удзельнічаў у *вайне Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1534—37*, *Лівонскай вайне 1558—83* у 1561. Быў праціўнікам *Люблінскай уніі 1569*, але акт уніі падпісаў.

Мікалай Паўлавіч (каля 1525—1.11.1599), сын Паўла Іванавіча. Вучыўся ў Лейпцыгскім і Кёнігсбер-

Да арт. **Сапегі**. Багдан Сямёнавіч Сапега. Гравюра І.Шубелера 1872 з партрэта 16 ст.

Да арт. **Сапегі**. Іван Сямёнавіч Сапега. Гравюра І.Шубелера 1872 з партрэта 16 ст.

Да арт. **Сапегі**. Ян Пётр Сапега. Гравюра В.Гондзіуса. 17 ст.

Паўн. вайны паліт. ўплыў С. паменшаў, аднак яны па-ранейшаму атрымлівалі гал. пасады ў цэнтр. і мясц. адміністрацыі ВКЛ. 14.9.1700 германскі імператар Леапольд I, каб узмацніць свой уплыў у Рэчы Паспалітай, надаў прадстаўнікам чарэйска-ружанскай лініі роду С. тытул князёў «Свяшчэннай Рымскай імперыі». Памылковымі з'яўляюцца звесткі пра наданне Івану Сямёнавічу С. графскага тытула ад германскага імператара Максіміляна II 6.1.1572 і пацвярджэнне гэтага тытула Жыгімонтам II Аўгустам 4.5.1572. Гэтыя фальсіфікаваныя дакументы былі ўпісаны ў Метрыку ВКЛ у 1744 канцлерам Янам Фрыдэрыкам С. і, такім чынам, сталі дзярж. дакументамі, на якія потым можна было спасылацца. У 1768 па патрабаванні С. сойм Рэчы Паспалітай на падставе гэтых запісаў прызнаў усіх С. князямі, нашчадкамі Нарымонта Гедзімінавіча. Княжацкі тытул С. быў пацверджаны ў

гскім ун-тах. Удзельнічаў у Лівонскай вайне 1558—83, у пераможнай *Ульскай бітве 1564*. Маршалак гаспадарскі ў 1566—76, ваявода мінскі ў 1578—88, брэсцкі ў 1588 і віцебскі з 1588. Падпісаў акт Люблінскай уніі 1569.

Багдан Паўлавіч (каля 1530 — 1-я пал. 1593), сын Паўла Іванавіча. Падкаморы бельскі ў 1566—69, староста гомельскі ў 1572—82, кашталян брэсцкі ў 1579—85 і смаленскі ў 1585—88, ваявода мінскі з 1588.

Леў Іванавіч (4.4.1557—7.7.1633), канцлер ВКЛ, гл. *Сапега* Л.І.

Андрэй Іванавіч (каля 1565—1611), малодшы брат канцлера Л.І.*Сапегі*. Староста аршанскі з 1588, кашталян віцебскі ў 1600—05, ваявода мсціслаўскі з 1605. У 1596 удзельнічаў у задушэнні паўстання С.Налівайкі, у вайне з Расіяй 1609—18.

Андрэй Паўлавіч (каля 1560 — да 11.10.1621), сын Паўла Іванавіча. У 1590-я г. вучыўся ў Падуанскім ун-це. Удзельнічаў у Лівонскай вайне 1558—83. Падчашы ВКЛ у 1588—92, кашталян мінскі ў 1592—97, ваявода полацкі ў 1597—1613 і смаленскі з 1621.

Павел Стафан (1565—19.7.1635), сын Багдана Паўлавіча. Вучыўся ў Віленскай акадэміі. Выбіраўся паслом на соймы. Канюшы ВКЛ у 1593—1623, падканцлер ВКЛ з 1623.

Ян Пётр (1569—15.10.1611), сын Паўла. Вучыўся ў Віленскай акадэміі, Падуанскім ун-це. Удзельнічаў у баях з крымскімі татарамі, у вайне са Швецыяй 1600—29. У жн. 1607 са згоды канцлера Л.І.*Сапегі* прапанаваў Ілжэдзмітрыю II сваю дапамогу ў авалоданні маскоўскім тронам. У ліп. 1608 з войскам перайшоў маскоўскую мяжу. 25.8.1608 заняў Вязьму, потым спаткаў Марыну Мнішак з яе бацькам і прывёз іх у Тушына да Лжэдзмітрыя II. 2.10.1608 разбіў войска І.Шуйскага пад Рахманавам, аблажыў Троіца-Сергіеў манастыр, падпарадкаваў Замаскварэцкі край. У лют. 1610 заняў Дзмітраў. 1.3.1610 пацярпеў паражэнне ад М.В.Скопіна-Шуйскага, у чэрв. 1610 далучыўся да Лжэдзмітрыя II у Калузе. У ліп. 1610 рушыў на Маскву. 27.7.1610, калі быў скінуты з трона цар Васіль Шуйскі і ўстанавілася сямібаяршчына, прыехаў у Маскву і вёў перагаворы пра перадачу ўлады Лжэдзмітрыю II. У ліп. 1611 заняў Аляксандраву Слабаду, аблажыў Пераяслаўль-Залескі, 15.8.1611 штурмам узяў Белы Горад у Маскве.

Мікалай (каля 1581—14.3.1644), сын Мікалая Паўлавіча. Вучыўся ў езуіцкім калегіуме ў Брунсбергу (Бранева), ун-тах Вены, Трыра, Майнца, Парыжа. Выбіраўся паслом на соймы, дэпутатам Трыбунала ВКЛ. Каралеўскі сакратар, харунжы ВКЛ у 1627—38, ваявода мінскі ў 1638 і брэсцкі ў 1638—42, кашталян віленскі з 1642.

Аляксандр Дажбог (Багдан, Тэадат; 1585 — студз. 1635), сын Рыгора. Вучыўся ў езуіцкім калегіуме ў Брунсбергу. Падкаморы віцебскі з 1606, староста аршанскі з 1610, кашталян віцебскі ў 1613—15, староста прапойскі і чачэрскі з 1622, крычаўскі (да 1631), чашнік ВКЛ у 1631—32. Удзельнічаў у баях за Смаленск у час *вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1609—18*, у вайне з туркамі ў 1621, са шведамі ў 1627.

Ян Станіслаў (25.10.1589, г. Маладзечна — 10.4.1635), сын канцлера Л.І.*Сапегі*. Вучыўся ў Віленскай акадэміі, езуіцкім калегіуме ў Брунсбергу, Вюрцбургскім, Падуанскім, Балонскім ун-тах. Пасол на соймы. Староста слонімскі з 1605, падстолі ВКЛ у 1611—17, маршалак дворны ў 1617—21, маршалак вялікі з 1621.

Андрэй Станіслаў (1592—25.3.1646), сын Яна Пятра. Староста ўсвяцкі ў 1612—23 і ваўкавыскі з 1645, кашталян трокскі ў 1641—44 і віленскі

Да арт. **Сапегі**. Казімір Леў Сапега. Гравюра П.Ландры. 1663.

з 1644. Пасол на соймы, дэпутат Трыбунала ВКЛ. Удзельнічаў у войнах з туркамі (1621), шведамі (1622—28).

Казімір Леў (15.7.1609, Вільня — 19.1.1656), сын канцлера Л. І.*Сапегі*. Вучыўся ў Віленскай акадэміі, езуіцкім калегіуме ў Мюнхене, Інгальштацкім, Лёвенскім, Балонскім ун-тах. Выбіраўся паслом на соймы, дэпутатам Трыбунала ВКЛ. Каралеўскі сакратар і вял. пісар ВКЛ у 1631—37, маршалак дворны ў 1637—45, падканцлер з 1645. Адміністратар Брэсцкай эканоміі, староста рагачоўскі. Удзельнічаў у *вайне Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67*.

Павел Ян (1609—30.12.1665), сын Яна Пятра. Удзельнічаў у *вайне Расіі з Рэччу Паспалітай 1632—34*. Абозны вялікі ВКЛ у 1638—45, падстолі ВКЛ у 1645—46, ваявода віцебскі ў 1646—56, ваявода віленскі і гетман вялікі з 1656. Выбіраўся паслом на соймы, маршалак Трыбунала ВКЛ у 1649. Удзельнічаў у вайне Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67.

Казімір Ян Павел (1642—13.3.1720), сын Паўла Яна. Вучыўся ва ун-тах Граца і Лёвена. З 1664 выбіраўся паслом на соймы. Чашнік ВКЛ у 1659—61, падстолі ў 1661—63, падскарбі дворны ў 1663—70, ваявода полацкі у 1670—81, гетман польны ў 1681—83, гетман вялікі ў 1683—1703 і 1705—08, ваявода віленскі ў 1682—1703 і з 1705, староста брэсцкі. Падтрымліваў караля *Міхала Вішнявецкага*, стаў лідэрам апазіцыі да ўсемагутных у 1670-х г. Пацаў. Удзельнічаў у паходах супраць туркаў. Устанавіў рэжым улады С. ў ВКЛ. У паўн. вайне 1700—21 стаў на бок шведаў.

Бенядзікт Павел (каля 1643—12.8.1707), сын Паўла Яна. З 1657 вучыўся ў езуіцкім калегіуме ў Грацы (Аўстрыя), з 1664 — у Лёвенскім ун-це (Іспанскія Нідэрланды). З 1664 выбіраўся паслом на соймы. Падстолі ВКЛ у 1663—65, стольнік у 1665—70, крайчы ў 1670, падскарбі дворны ў 1670—76, падскарбі вялікі з 1676, староста слонімскі. На элекцыйным сойме 1674 быў маршалкам і садзейнічаў абранню на трон Яна III Сабескага, што спрыяла ўстанаўленню гегемоніі С. у ВКЛ. У Алькеніцкай бітве 18.11.1700 яго армія разбіта. У сак. 1702 перайшоў на бок шведаў.

Да арт. **Сапегі**. Павел Ян Сапега. Гравюра П.Ландры. 1663.

Казімір Уладзіслаў (1650—29.4.1703), сын Яна Фрыдэрыка. Вучыўся ў езуіцкіх навуч. установах у Львове і Брунсбергу. Удзельнічаў у войнах з туркамі. Пасол на соймы. Падстолі ВКЛ у 1685—86, стольнік у 1686, падскарбі надворны ў 1686—89, трокскі кашталян у 1689—97 і ваявода з 1697.

Уладзіслаў Юзафат (5.11.1652,

г. Косава Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл. — 13.3.1733), сын Крыштофа Францішка. Вучыўся ў езуіцкіх калегіумах у Любліне і Брунсбергу, ун-тах Прагі і Вены. Удзельнічаў у вайне 1673—74 супраць туркаў. Чашнік ВКЛ у 1681—84, крайчы ў 1684—99, ваявода мінскі ў 1699—1709 і брэсцкі з 1709. Выбіраўся паслом на соймы, дэпутатам Трыбунала ВКЛ.

Ежы Станіслаў (1668—12.10.1732), сын Казіміра Яна Паўла. Вучыўся ў Вільні і Брунсбергу. Удзельнічаў у войнах супраць туркаў. Выбіраўся паслом на соймы. Падстолі ВКЛ у 1686, стольнік ВКЛ у 1686—1703 і з 1709, ваявода мсціслаўскі ў 1732.

Да арт. **Сапегі**. Ян Фрыдэрык Сапега. Партрэт невядомага мастака. Каля 1720.

Міхал Францішак (1670—19.11.1700), сын Казіміра Яна. Вучыўся ў езуіцкіх калегіумах у Варшаве і Брунсбергу. У 1689 паступіў на службу ў аўстрыйскае войска, ўдзельнічаў у войнах супраць туркаў, ген.-маёр (1692). У 1696 вярнуўся ў ВКЛ. Канюшы ВКЛ з 1690, адначасова ген. артылерыі з 1698, староста ашмянскі з 1699. У 1700 атрымаў ад аўстр. імператара чын ген.-фельдмаршала-лейтэнанта і тытул князя «Свяшчэннай Рымскай імперыі». Камандаваў сапегаўскімі войскамі ў вайне супраць шляхты — «рэспубліканцаў». У Алькеніцкай бітве 18.11.1700 капітуляваў і быў засечаны шляхтай.

Міхал Юзаф (1670—6.3.1738), сын Бенядзікта Паўла. Вучыўся ў езуіцкім калегіуме ў Варшаве. Выбіраўся паслом на соймы. Чашнік ВКЛ у 1687—92, стражнік у 1692—98, пісар польны ў 1698—1730, ваявода падляшскі з 1728, ген.-маёр войска ВКЛ (1710), ген.-лейт. кавалерыі (1714), ген.-лейт. саксонскага войска (1733).

Аляксандр Павел (8.9.1672—4.1.1734), сын Казіміра Яна Паўла. Вучыўся ў езуіцкім калегіуме ў Брунсбергу, у 1685—89 у Парыжы. Чашнік ВКЛ у 1692, маршалак дворны ў 1692—98, маршалак вялікі ў 1698—1703, 1705—08 і з 1713.

Ежы Феліцыян (лют. 1680—3.9.1750), сын Францішка Стафана. Вучыўся ў езуіцкім калегіуме ў Брунсбергу і за мяжой. Ген.-маёр (1708). Выбіраўся паслом на соймы, маршалак Трыбунала ВКЛ у 1717, ваявода мсціслаўскі з 1742.

Ян Фрыдэрык (18.10.1680, в. Дабратычы, Брэсцкі пав. — 6.7.1751), сын Казіміра Уладзіслава. Вучыўся ў езуіцкіх калегіумах у Брэсце, Любліне і Варшаве. Кашталян мінскі ў 1711—12, троцкі ў 1716—35, канцлер ВКЛ з 1735. Выбіраўся паслом на соймы, дэпутатам Трыбунала ВКЛ. Напісаў гісторыю абраза Дзевы Марыі ў Кодані (Торунь, 1720), гіст.-генеалагічны нарыс роду С. (Варшава, 1730) і інш. У Кодані сабраў вял. б-ку, у Коданскім касцёле стварыў партрэтную галерэю С.

Да арт. **Сапегі**. Міхал Антоні Сапега. Партрэт сярэдзіны 18 ст.

Ян Казімір (? — 22.2.1730), дзярж. і ваенны дзеяч; гл. *Сапега* Я.К.

Антоні Казімір (1689—16.5.1739), сын Ежы Станіслава. Вучыўся ў Парыжы. Стольнік ВКЛ у 1706—09, кашталян троцкі з 1737. Пасол на соймы, дэпутат Трыбунала ВКЛ. Аўтар дыярыуша (не надрукаваны).

Ігнацы (?—15.4.1758), сын Уладзіслава Юзафата. Пасол на соймы, дэпутат Трыбунала ВКЛ. Чашнік ВКЛ у 1740—44, падскарбі надворны ў 1744—50, ваявода мсціслаўскі з 1750.

Кароль Юзаф (?—20.3.1768), сын Уладзіслава Юзафата. Выбіраўся паслом на соймы. Пісар польны ВКЛ у 1730—48, ваявода брэсцкі з 1748.

Да арт. **Сапегі**. Аляксандр Міхал Сапега. Партрэт 2-й пал. 18 ст.

Да арт. **Сапегі**. Казімір Нестар Сапега. Партрэт Ю.Пічмана.

Пётр Павел (28.1.1701, г. Дрэздэн, Германія — 23.1.1771), сын Яна Казіміра. У 1726 з дапамогай імператрыцы *Кацярыны I* быў заручаны з дачкой А.Д.*Меншыкава* Марыяй, стаў царскім камергерам. У 1728 выехаў у Рэч Паспалітую, стольнік ВКЛ у 1732—44, ваявода смаленскі з 1744. Далучыўся да *Барскай канфедэрацыі*, у 1770 выехаў у Славакію.

Міхал Антоні [10 або 12.3.1711, г. Кралявец (Калінінград, Расія) — 11.10.1760], сын Аляксандра Паўла. З 1732 выбіраўся паслом на соймы. Лоўчы ВКЛ у 1739—46, ваявода падляшскі ў 1746—52, падканцлер ВКЛ з 1752. Староста мсціслаўскі з 1757.

Аляксандр Міхал (12.9.1730—28.5.1793), сын Казіміра Лявона. Вучыўся ў езуіцкім калегіуме ў Любартаве. З 1746 неаднаразова выбіраўся паслом на соймы. Абозны ВКЛ у 1748—50, ген.-маёр (1750), падскарбі дворны ў 1750—54, ваявода полацкі ў 1754—75, гетман польны ВКЛ у 1762—75, канцлер з 1775. У 1792 па прапанове кароля далучыўся да *Таргавіцкай канфедэрацыі* і быў абраны яе маршалкам у ВКЛ.

Казімір Нестар (14.2.1757, г. Брэст — 25.5.1798), сын Яна. У 1767—72 вучыўся ў Рыцарскай школе ў Варшаве, пазней у ваеннай акадэміі ў Турыне, у Парыжы, у Страсбургу. З 1772 палкоўнік артылерыі войска ВКЛ, у 1773—93 ген. артылерыі. З 1778 выбіраўся паслом на соймы. З 1778 чл. Пастаяннай Рады. Староста брэсцкі з 1783. На *Чатырохгадовым сойме 1788—92* абраны маршалкам канфедэрацыі ВКЛ, прыхільнік рэформ. Удзельнічаў у *паўстанні 1794*.

Францішак (28.8.1772, Варшава — 30.5.1829), сын Аляксандра Міхала. Вучыўся ў Віленскай гал. школе (ун-це). Ген. артылерыі ВКЛ у 1793—95, шэф карпусоў артылерыі і інжынераў. Удзельнік паўстання 1794. Атрымаў чын ген.-лейтэнанта, камандаваў дывізіяй. Пасля задушэння паўстання прысягнуў Кацярыне II.

Аляксандр Антоні (3.9.1773, г. Страсбург, Францыя — 8.9.1812), сын Юзафа. Атрымаў хатнюю адукацыю. Ажыццявіў мінералагічныя экспедыцыі ў Польшчы і Літве, а таксама ў Альпы, на Балканы і Вальнь. Аўтар працы «Мінералогія» (1800—01), падручніка па неарган. хіміі, нарыса па крышталяграфіі. Вывучаў этнаграфію славенцаў, харватаў, баснійцаў, герцагавінцаў. Вынікі даследаванняў апублікаваў у працы «Падарожжа ў славянскіх краінах у 1802 і 1803 гг.» (1811) у форме лістоў да Ж.Э.Жылібера. У 1807 арганізаваў знаходжанне Напалеона ў Варшаве, стаў афіцэрам яго гвардыі, камергерам. 1.7.1812 увайшоў у склад *Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага*.

Яўстафій Каэтан (7.8.1797, Вільня — 16.11.1860), сын Францішка. Удзельнічаў у паўстанні 1830—31, паручнік у штабе галоўнакамандуючага ген. Я.Скшынецкага, адзначаны залатым крыжам «Віртуці Мілітары». Пасля паражэння паўстання ў эміграцыі ў Францыі. Адхіліў прапанову *Мікалая I* прыняць канфіскаваныя маёнткі ўзамен за вернападданую прысягу, у выніку чаго музейныя зборы, б-кі і архівы С. вывезены ў С.-Пецярбург.

Адам Стафан (14.5.1867, г. Красічын, Польшча — 23.7.1951), сын Адама. Вучыўся ў Вене, Інсбруку. З 1911 біскуп кракаўскі. З 1925 мітрапаліт кракаўскі, з 1926 архібіскуп мітрапаліт. Утварыў арг-цыю католікаў «Акцыя каталіцка» і касцельную дабрачынную арг-цыю «Карытас». У час 2-й сусв. вайны звязаны з падп. рухам. З 1946 кардынал.

Літ.: Sapiehowie: Materiały historyczno-genealogiczne i majątkowe. T. 1—3. Pb., 1890—94; Labarre de Raillicourt D. Histoire des Sapieha, 1440—1970. Paryż, 1970; Polski słownik biograficzny. T. 34—35. Wrocław etc., 1993—94; Dom Sapieżyński. Warszawa, 1995; Dzieje rodu Sapiehów. Warszawa, 1999. *А.П.Грыцкевіч.*

САПЁГІН Леанід Міхайлавіч (26.11.1935, г. Гомель), бел. вучоны ў галіне батанікі. Д-р біял. н. (1987), праф. (1990). Скончыў Гомельскі пед. ін-т (1959), з 1964 працаваў у ім, з 1969 у Гомельскім ун-це (у 1986—96 заг. кафедры). Навук. працы па сінтаксанаміі, саставе, структуры і прадукцыйнасці лугавой расліннасці бел. Палесся, распрацоўцы аптымальнай экалагічнай стратэгіі рацыянальнага выкарыстання, паляпшэння і аховы лугавой расліннасці.

Тв.: Структура и изменчивость луговых фитоценозов. Мн., 1981; Пойменные луга юго-востока БССР, их рациональное использование, улучшение и охрана. Мн., 1985; Геабатаніка. Мн., 2000.

САПЁРЫ (франц. sapeur ад saper весці падкоп), ваеннаслужачыя сапёрных (інж.-сапёрных) часцей і падраздзяленняў. Існуюць у арміях усіх дзяржаў. На Беларусі ўваходзяць у склад асобных інж.-сапёрных батальёнаў і інш. часцей і падраздзяленняў.

Да арт. **Сапегі**. Францішак Сапега. Партрэт 19 ст.

Да арт. **Сапегі**. Яўстафій Каэтан Сапега. Партрэт 19 ст.

Атрады воінаў, якія вялі падкопы пад крапасныя сцены, рабілі завалы ў час абароны гарадоў і інш., вядомы з часоў старажытнасці. У час ваен. дзеянняў воіны ВКЛ таксама рабілі падкопы пад крапаснымі збудаваннямі праціўніка, напр., у 1535 пад Старадубам у час вайны Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ (1534—37), у 1581 пад Псковам у час Лівонскай вайны (1558—83) і інш. з мэтай іх разбурэння. З пач. 17 ст. ў Францыі, потым у інш. краінах, С. наз. рабочых і салдат, што рабілі падкопы пад крапаснымі збудаваннямі. У далейшым абавязкам С. стала выкананне ўсіх ваен.-інж. работ, звязаных з вядзеннем бою. З 1678 у Францыі, пазней у інш. дзяржавах (у Расіі з пач. 18 ст.) С. аб'яднаны ў спец. часці і падраздзяленні. У Расіі з 1829 піянерныя падраздзяленні (гл. *Піянеры*) перайменаваны ў сапёрныя (існавалі да сярэдзіны 19 ст.). У пач. 20 ст. часці і падраздзяленні С. уваходзілі ў склад *інжынерных войск*. У 1941—42 ў складзе сав. войск дзейнічалі сапёрныя арміі (расфарміраваны ўвосень 1942, часці і злучэнні перададзены франтам), потым — інж., інжынерна-сапёрныя і інш. злучэнні і часці. У пасляваенны час на тэр. Беларусі С. праводзілі размінiраванне, у т.л. суцэльнае, ахоўвалі і ўмацоўвалі масты, дамбы і інш. збудаванні ў час паводкі, удзельнічалі ў буд-ве метро і інш. У гонар С. у Мінску ў адным з мікрараёнаў наз. вуліца Сапёраў.

Літ.: Цирлин А.Д. Советские инженерные войска. 2 изд. М., 1969; Данилов А. Развитие военно-инженерного искусства // Армия. 2000. №6. *І.А.Шор.*

САПЛО́, канструктыўны элемент у выглядзе канала пераменнага сячэння для разгону вадкасці ці газу (пары) і надання патоку зададзенага напрамку. У С. ўнутр. (цеплавая) энергія і патэнцыяльная энергія ціску рабочага цела ператвараюцца ў кінетычную (дынамічны разгон). Накіроўвае паток у актыўнай *гідраўлічнай турбіне*, дазіруе расход вадкасці (гл. *Расходамер*), надае неабходную скорасць струменю ў паравой турбіне; распыльвае (гл. *Фарсунка*). Рэактыўнае С. (рэактыўны рухач) — частка *рэактыўнага рухавіка*.



Рэактыўнае **сапло**: 1 — дагукавое; 2 — звышгукавое (стрэлкі — напрамак руху газу).

САПО́ЖНІКАЎ Аляксандр Рыгоравіч (15.10.1950, с. Багалюбава Холм-Жыркоўскага р-на Смаленскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне паталаг. анатоміі і суд. медыцыны. Праф. (1994). Скончыў Смаленскі мед. ін-т (1973). У 1982—96 у Віцебскім мед. ін-це (з 1990 заг. кафедры). Навук. працы па марфал. зменах у органах і тканках пры іх гніенні.

САПО́ЦКІН, гарадскі пасёлак у Гродзенскім р-не, на аўтадарозе, якая злу-

чае яго з г. Гродна. За 21 км на ПнЗ ад Гродна. 1,5 тыс. ж. (2001).

Вядомы з 16 ст. як мястэчка Гродзенскага пав. Трокскага, з 1793 — Гродзенскага ваяв. ВКЛ. Меў уласны герб. З 1795 у складзе Усх. Прусіі, з 1807 у *Варшаўскім герцагстве*, з 1815 у Рас. імперыі — у *Аўгустоўскім павеце* Царства Польскага, з 1837 у Аўгустоўскай, з 1867 у Сувалкаўскай губ. У 1858 С. — мястэчка (1568 ж., 160 дамоў, касцёл, царква, пошта, маслабойня) і маёнтак. У 1897 — 3900 ж., выраб кафлі, цэментных пліт, шкла, масла. У 1900 С. — пасёлак, 6595 ж. У 1921—39 у складзе Польшчы, у Валавічоўскай гміне Аўгустоўскага пав. Беластоцкага ваяв. У 1921—1774 ж., 294 дамы. З 1939 у складзе БССР, з 1940 гар. пасёлак, цэнтр *Сапоцкінскага раёна* Беластоцкай, з 1944 — Гродзенскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 22.6.1941 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў сапоцкінскім лагеры смерці 539 чал., 15.6.1944 расстралялі 70 чал. 18.7.1944 С. вызвалены войскамі 3-га Бел. фронту ў ходзе Беластоцкай і Вільнюскай аперацый 1944. З 1959 у Гродзенскім р-не.

У пасёлку лесазавод, упраўленне біял. заказніка *Сапоцкінскі*, ПТУ сельскай гаспадаркі, сярэдняя і муз. школы, дашкольная ўстанова, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, аддз. сувязі. Помнікі архітэктуры: *Сапоцкінскія капліцы*, касцёл Успення Дзевы Марыі і царква (пач. 20 ст.). З брацкія магілы сав. воінаў, магіла ахвяр фашызму. На зах. ускраіне помнік археалогіі — курганны могільнік (10—11 ст.). *В.М.Князева.*

САПО́ЦКІНСКІ, біялагічны заказнік рэсп. значэння ў Гродзенскім р-не. Засн. ў 1978 для аховы прыродных запасаў лек. раслін, ландшафтных і фларыстычных комплексаў з рэдкімі і знікаючымі відамі. Пл. 12,6 тыс. га. Займае лясны масіў, у якім пераважаюць хвойнікі імшыстыя, верасовыя, арляковыя, бруснічныя, чарнічныя і інш. Трапляюцца ельнікі, бярэзнікі, чорнаалешнікі. Выдзелены рэдкія ландшафтныя прыродныя комплексы: участак стужачных ліпнякоў, поймавых дуброў і грабнякоў, хвойніку на карэнным беразе р. Нёман і інш. Лек. расліны: талакнянка, брусніцы, ядловец, цмен пясчаны, ландыш майскі і інш. Купальнік горны, баранец звычайны, сон лугавы, мнаганожка звычайная, лопух дуброўны, сіела прамая, кастрэц Бенякена, кураслеп лясны занесены ў Чырв. кнігу. З прадстаўнікоў фауны, занесеных ў Чырв. кнігу, барсук, бугай вялікі, бусел чорны, аляпка, варакушка, махаон, стужка ордэнская блакітная, чмель шрэнка і інш. *П.І.Лабанок.*

САПО́ЦКІНСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1940—59. Створаны 15.1.1940 у складзе *Беластоцкай вобласці*, з 20.9.1944 — у *Гродзенскай вобласці*. Цэнтр — г.п. *Сапоцкін*. 12.10.1940 падзелены на 12 сельсаветаў: Багатырскі, Валавічоўскі, Галынкаўскі, Ласоснаўскі, Ліпскі, Лойкаўскі, Навікоўскі, Навумавіцкі, Рыгалаўскі, Сільванавіцкі, Соніцкі, Старабагатырскі; 16.8.1945 Ліпскі с/с перададзены Польшчы. 10.3.1959 раён скасаваны, тэрыторыя далучана да *Гродзенскага раёна*.

САПО́ЦКІНСКІЯ КАПЛІ́ЦЫ, помнікі архітэктуры неаготыкі ў г.п. Сапоцкін Гродзенскага р-на. Пабудаваны ў 1868 і 1893 з цэглы як фамільныя пахавальні. Капліца 1868 — кампактнае прамавугольнае ў плане збудаванне з высокім 2-схільным дахам. Шчыт гал. фасада завершаны 4-граннай сігнатуркай. Уваход і ніша над ім, бакавыя аконныя праёмы стральчатай формы. Сцены атынкаваныя з украпінамі дробнага друзу, на шэрым фоне якога вылучаюцца пабеленыя верт. і гарыз. цягі, ліштвы праёмаў. Капліца 1893 — прамавугольная ў плане, пад 2-схільным дахам. Гал. фасад завершаны трапецападобным шчытом з 3 вуглавымі 8-граннымі шатровымі сігнатуркамі і крапаваны слаістымі арачнымі нішамі. Стральчаты праём гал. ўвахода фланкіраваны арачнымі эдыкуламі. Бакавыя фасады расчлянёны 4 стральчатымі аконнымі праёмамі. Алтарная сцяна ў інтэр'еры дэкарыравана плоскім 4-пілястравым порцікам з трохвугольным франтонам. *А.М.Кулагін.*

Сапоцкінскія капліцы.

САПРАБІЁНТЫ, сапробы (ад грэч. sapros гнілы + bios жыццё), жывыя арганізмы, якія жывуць у забруджаных арган. рэчывамі вадаёмах. Здольнасць С. мінералізаваць арган. рэчывы спрыяе біял. самаачышчэнню вадаёмаў і выкарыстоўваецца пры *біялагічнай ачыстцы* сцёкавых вод. Відавы склад і колькасць С. — біялагічныя індыкатары ступені забруджанасці вадаёмаў. Для кожнай ступені забруджанасці вызначаны паказальныя арганізмы. Вылучаюць поліз-, мезо- і алігасапрабіёнты.

Полісапрабіёнты жывуць у моцназабруджаных вадаёмах, якія характарызуюцца наяўнасцю нязгнілых бялковых рэчываў, вял. колькасцю вуглекіслаты, серавадароду і метану, адсутнасцю кісларода. Згуртаванні полісапрабіёнтаў хутка змяняюцца, утвараюць слізістыя камякападобныя абрастанні, характарызуюцца вял. колькасцю асобін нешматлікіх відаў. На Беларусі да іх належаць некат. бактэрыі (сфератылус натанс, тыётрыкс нівея), зялёная водарасць асцыляторыя, некат. інфузорыі і жгуціканосцы, чарвяк тубіфекс, лічынка мухі-пчалавідкі («крыска»). Мезасапрабіёнты жывуць ва ўмерана забруджаных водах, дзе няма нязгнілых бялкоў, ёсць кісларод і прадукты акіслення — нітраты і нітрыты. Да іх належаць ніткавыя бактэрыі, водарасці, мукоравыя грыбы, прасцейшыя, малюскі, ракападобныя, лічынкі насякомых (напр., матыль), некат. рыбы. Алігасапрабіёнты жывуць у чыстых або слабазабруджаных вадаёмах, якія характарызуюцца добрымі акісляльнымі ўмовамі, невял. колькасцю свабоднай вуглекіслаты, адсутнасцю серавадароду. Вызначаюцца залацістыя водарасці з роду дынобрыян, пірафітавыя з роду цэрацыум і дыятомавыя з роду цыклатэла, сінедра, ніцшыя; кветкавыя расліны — рдзесты, шышнякі, гарлачык; галінаставусыя ракападобныя, рачныя ракі, амаль усе рыбы, трытоны, жабы. Проціпастаўляюць *катарабіёнтам*. Гл. таксама *Сапробнасць*.

САПРАЛЕГНІЯЛЬНЫЯ (Sapralegniales), парадак грыбоў адміцэтаў. Больш за 10 родаў і больш за 100 відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі 17 відаў з 6 родаў. Найб. вядомыя роды афанаміцэс, ахлія, сапралегнія. Трапляюцца пераважна ў прэсных вадаёмах. Прымітыўныя віды — унутрыклетачныя паразіты водарасцей, водных грыбоў, рыб, жаб, ікры, планктонных арганізмаў; больш арганізаваныя — *сапратрофы* на трупах водных жывёл і субстратах расліннага паходжання.

Вегетатыўнае цела — талом (клетка) або несептаваны аднаклетачны *міцэлій*, які мае 2 віды гіфаў. Тонкія галінастыя (рызоідныя) гіфы прарастаюць у субстрат, тоўстыя растуць свабодна і нясуць органы бясполага і палавога размнажэння — зааспарангіі, *аагоніі* і *антэрыдыі*. Зааспоры двужгуцікавыя. Вынік палавога працэсу — *ааспора*.

Літ.: Жизнь растений. Т.2. Грибы. М., 1976. *С.І.Бельская.*

САПРА́НА (італьян. soprano ад sopra над, звыш), 1) самы высокі пеўчы (у асн. жаночы ці дзіцячы) голас. Асн. разнавіднасці С.: драм., лірычнае і каларатурнае; а таксама лірыка-драм., лірыка-каларатурнае і інш. 2) Самая высокая партыя ў мяшаным хоры. 3) Высокія па рэгістры разнавіднасці некат. муз. інструментаў (сапранавыя труба, саксафон і інш.).

САПРАПЕЛІ́Т (ад грэч. sapros гнілы + pēlos глей, гразь), выкапнёвы вугаль пераважна з прадуктаў ператварэння рэшткаў ніжэйшых раслін і жывёльных арганізмаў. Паводле саставу, ступені раскладання і ператварэння зыходнага матэрыялу вылучаюць уласна С. і гуміта-С. (пераходная рознасць паміж уласна С. і сапрагумалітамі). Паводле саставу адрозніваюць С.: кенель-богхеды, касьяніт-богхеды і чарамхіты. Колер цёмна-карычневы, шаравата-чорны. Аднародныя, масіўныя, цвёрдыя, вязкія. Выхад лятучых кампанентаў 55—70%. Складаюць праслоі (лінзы) у пластах гумалітаў, якія зведалі буравугальную або пач. этапы кам.-вуг. стадыі метамарфізму. Каштоўная хім. сыравіна. Трапляецца на многіх буравугальных радовішчах.

САПРАПЕ́ЛЬ (ад грэч. sapros гнілы + pēlos глей, гразь), глеістыя адклады прэсных вадаёмаў, якія маюць у сабе больш за 15% арган. рэчыва. Фарміруецца з рэшткаў раслін, жывёл, мінер. і арган. дамешкаў. Верхняя тоўшча С. (пелаген) паўвадкая, ніжэй масляністая. Багатыя арганікай С. студзінападобныя. Мае гумінавыя к-ты, фульвакіслоты, геміцэлюлозу, бітумы, попел (у сярэднім 20—60%). Асн. кампаненты попелу — аксіды крэмнію, магнію, жалеза, алюмінію, марганцу, фосфару, натрыю, вуглякіслы кальцый, некат. мікраэлементы. Колер попельна-шэры да цёмна-карычневага, ад мінер. дамешкаў светла-шэры. Выкарыстоўваюць у сельскай гаспадарцы (як угнаенне і дамешак у корм жывёле), медыцыне (грязелячэнне), буд-ве, хім. прам-сці. На Беларусі магутнасць адкладаў С. у азёрах 2—12 м, найб. 30 м (воз. Судабле Смалявіцкага р-на Мінскай вобл.); агульныя запасы каля 3,8 млрд. м^3.

САПРАТРО́ФЫ [ад грэч. sapros гнілы + ...*троф*(ы)], арганізмы, якія ўжываюць арган. злучэнні мёртвых цел або выдзяленні (экскрэменты) жывёл. Паводле тыпу харчавання адносяцца да *гетэратрофаў*. Удзельнічаюць у мінералізацыі арган. злучэнняў, з'яўляюцца важным звяном у біял. кругавароце рэчыва і энергіі. Да С. адносяцца бактэрыі, актынаміцэты, грыбы, расліны-паразіты, некат. водарасці, з жывёл — *сапрафагі* (напр., жукі-гнаевікі, вароны, гіены). Водныя С. ўдзельнічаюць ў біял. ачыстцы вады, глебавыя — у глебаўтварэнні, спрыяюць павышэнню ўрадлівасці глебы.

САПРА́ЎДНЫ ВІДАРЫ́С, відарыс утвораны збежнымі пучкамі прамянёў у пунктах іх перасячэння; гл. *Відарыс аптычны*.

САПРА́ЎДНЫ ЛІК, рэчаісны лік, любы дадатны, адмоўны *лік* ці нуль. Адрозніваюць *рацыянальны лік* і *ірацыянальны лік*. З дапамогай С.л. выражаюцца вынікі вымярэння ўсіх фіз. велічынь.

САПРА́ЎДНЫЯ ВО́СЫ, грамадскія восы, складкаватакрылыя восы (Vespoidea ці Vespidae), надсямейства ці сям. насякомых атр. перапончатакрылых. Пашыраны паўсюдна, пераважна ў тропіках. На Беларусі больш за 25 відаў адзіночных, грамадскіх восаў і *шэршняў*. Апыляльнікі раслін, знішчаюць шкодных насякомых, шэршні шкодзяць пчалярству.

Цела даўж. 8—30 мм, прадаўгаватае, голае або ўкрыта валаскамі. На брушку чорныя і жоўтыя палосы. Пярэднія крылы складваюцца ўдоўж. Вусікі ніткападобныя, у самцоў 13-, у самак 12-членікавыя. Пярэднягрудзі маюць дугападобную выразку, якая дасягае асновы крылаў. Жывуць у гнёздах (паўсфера з ячэйкамі ў адзін паверх, сфера з шматпавярховымі ячэйкамі ці інш.). Соты будуюць з «паперы», якую атрымліваюць з перажаваных і апрацаваных ферментамі расл. рэшткаў. Лічынак кормяць інш. насякомымі, пераважна вусенямі. Развіццё з поўным ператварэннем. Зімуюць аплодненыя маткі.

САПРА́ЎДНЫЯ ІМХІ́, тое, што *лістасцябловыя імхі*.

САПРА́ЎДНЫЯ ШАЎКАПРА́ДЫ (Bombycidae), сямейства матылёў. У сусв. фаўне 20 відаў, пашыраных пераважна ў тропіках. Найб. значны прадстаўнік сям. — аб'ект штучнага развядзення *тутавы шаўкапрад*, у прыродзе не адзначаецца.

Сапраўдныя восы: 1 — звычайная; 2 — французская; 3 — лясная; 4 — гняздо лясной асы.

Цела масіўнае, ротавыя органы рудыментарныя (дарослыя матылі не кормяцца), вусікі грабеньчатыя. Пярэднія крылы маюць выразку па знешнім краі, серпападобную вяршыню. Вусень з кароткім шыпападобным вырастам на 8-ым сегменце брушка, пярэдняя ч. цела звужана. Кукалка развіваецца ў шаўкавістым кокане.

САПРАФА́ГІ [ад грэч. sapros гнілы + *фаг*(і)], жывёлы, якія кормяцца гнілымі і адмерлымі рэшткамі жывёл і раслін. Вылучаюць *дэтрытафагаў* (кормяцца сумессю гніючых рэчываў — *дэтрытам*), *капрафагаў* (кормяцца экскрэментамі), *некрафагаў* (кормяцца трупамі жывёл), ксілафагаў (кормяцца драўнінай) і інш. Большасць С. належыць да беспазваночных жывёл. На Беларусі тыповыя С. — крумкач, жукі-магільшчыкі, мерцвяеды, караеды, лічынкі мух, дажджавыя чэрві і інш; частковымі С. з'яўляюцца воўк, янотападобны сабака, ліс, мядзведзь, сом, рачны рак, плывунцы і інш. С. адыгрываюць у прыродзе ролю санітараў, паскараюць кругаварот рэчываў у біягеацэнозах, удзельнічаюць у глебаўтварэнні, павышаюць урадлівасць глеб, з'яўляюцца звяном кармавых сувязей, некат. скураеды, молі прычыняюць значную шкоду.

САПРО́БНАСЦЬ, здольнасць арганізмаў (*сапрабіёнтаў*) жыць у забруджаных арган. рэчывамі водах. Паняцце «С.» сфармулявана заснавальнікамі сан. гідрабіялогіі ў Расіі Я.Я.Нікіцінскім, Г.І.Далговым. Вылучаюць воды полісапробныя (воды, якімі запаўняюць сажалкі біял. ачысткі і палі фільтрацыі), мезасапробныя (воды большасці рэк, у якія скідваюцца сцёкі гарадоў і прамысл. аб'ектаў) і алігасапробныя (воды незабруджаных вадаёмаў). Размеркаванне пэўных відаў раслін і жывёл у залежнасці ад ступені С. вады дазваляе выкарыстоўваць іх як біялагічны індыкатар ступені забруджвання вады арган. рэчывамі. У сувязі з інтэнсіўным забруджваннем вод ужываюць больш шырокае паняцце — таксафобнасць. Павелічэнне С. спрыяе эўтрафікацыі вадёмаў (інтэнсіўнаму развіццю воднай раслінасці).

САПРЫ́КА Ганна Іосіфаўна (16.6.1911, в. Куркаўшчына Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 14.5.1962), бел. пісьменніца. Скончыла Мсціслаўскі пед. тэхнікум (1930), Бел. вышэйшы пед. ін-т (1933). Працавала ў Бел. дзярж. выд-ве. Друкавалася з 1926. Аўтар кнігі прозы «Калі ў сэрцы вясна» (1959). На бел. мову пераклала творы М.Вірты «Мой памочнік Карсыбек», В.Авечкіна «Раённыя будні» (з М.Герасімовіч), Я.Галана «З крыжом ці з нажом», А.Макаранкі «Педагагічная паэма» і інш.

САПРЫ́КІН Уладзімір Аляксеевіч (24.8.1916, в. Сухадол Ліпецкай вобл., Расія — 24.4.1990), удзельнік баёў на

Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Грозненскае ваен. вучылішча (1941), Політэхн. ін-т у Таронта (Канада, 1950-я г.). У Вял. Айч. вайну з 1941 на 1-м Бел. фронце. Батальён на чале з капітанам С. 1—3.12.1943 у баях за в. Чырвоная Слабада Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. штодзень адбіваў па 10—12 контратак ворага; апынуўшыся ў шчыльнай аблозе ворага, С. выклікаў агонь сав. артылерыі на сябе; палічаны загінуўшым. Цяжка паранены трапіў у палон, з 1946 у Канадзе, за што з 1977 да 1992 сав. ўладамі быў пазбаўлены званне Герой Сав. Саюза. Перапахаваны на месца апошняга бою.

САПРЫ́НАВІЧЫ, вёска ў Мсціслаўскім р-не Магілёўскай вобл., на аўтадарозе Мсціслаў—Хіславічы (Расія). Цэнтр сельсавета і калгаса. За 5 км на У ад г. Мсціслаў, 100 км ад Магілёва, 24 км ад чыг. ст. Ходасы. 373 ж., 135 двароў (2001). Сярэдняя школа-сад, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

САПСА́Н, сокал-сапсан (Falco peregrinus), птушка сям. сакаліных атр. сокалападобных. Пашыраны ў Еўразіі, Амерыцы, Афрыцы, Аўстраліі. На Беларусі вельмі рэдкі гнездавальны і вандроўны від. Жыве ў разрэджаных барах паблізу рачных поймаў і вял. балот, на ўчастках старых хваёвых лясоў з адкрытымі прасторамі. Занесены ў Чырв. кнігу Беларусі.

Сапсан.

Даўж. да 49 см, маса да 1 кг. Крылы доўгія, вострыя, хвост клінападобны. Апярэнне цёмна-бурае, ніз цела светлы з тонкім папярочным малюнкам на баках і падхвосці (больш яркі ў самак). На грудзях кроплепадобныя стракаціны. Пад вачыма цёмныя плямы («вусы»). Гнёзды на дрэвах, селяцца ў гнёздах варон, крумкачоў, інш. буйных птушак. У кладцы 2—4 чырванавата-карычневыя яйцы. Асн. корм. — птушкі, якіх ловіць у палёце.

САПУНО́Ў Аляксей Парфенавіч (27.3.1851, г.п. Усваты Пскоўскай вобл., Расія — 2.10.1924), бел. гісторык, археограф, краязнавец. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1873). У 1873—96 настаўнік лац. і грэч. моў у Віцебскай гімназіі. З 1896 архіварыус *Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актаў*, з 1897 выкладчык Маскоўскага ун-та. У 1901—07 і з 1913 сакратар Віцебскага губ. стат. к-та. У 1907 выбраны дэпутатам ад Віцебскай губ. ў Дзярж. думу 3-га склікання, дзе падтрымліваў акцябрыстаў. З 1918 заг. секцыі дэмаграфіі ў губ. стат. бюро, з 1919 — у Віцебскім губ. архіве. Удзельнік стварання *Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея* і *Віцебскай вучонай архіўнай камісіі*. Адзін з ініцыятараў адкрыцця *Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута*, у якім выкладаў у 1911—22 (з 1913 праф.). Даследаваў гісторыю, л-ру, этнаграфію, археаграфію, архітэктуру, фальклор Беларусі, пераважна Падзвіння. Выявіў і зрабіў палеаграфічныя апісанні стараж. рукапісных помнікаў, апісаў Барысавы камяні, архівы Віцебшчыны, Магілёўшчыны, Мінска. Сярод твораў: «Полацкі Сафійскі сабор» (1888), «Дзвінскія або Барысавы камяні» (1890), «Рака Заходняя Дзвіна: Гісторыка-геаграфічны агляд» (1893), «Помнікі часоў старажытных і найноўшых у Віцебскай губерні» (1903), «Універсітэт у Полацку» (1908) і інш. Найб. буйная праца С. — зб. дакументаў «*Віцебская даўніна*» (т. 1, 4—5, 1883—88).



А.П.Сапуноў.

Літ.: Стукалич В.К. А.П.Сапунов: К 25-летию его ученой и лит. деятельности. Витебск, 1905; Падліпскі А. Летапісец Віцебшчыны. Мн., 1993. *А.М.Філатава.*

САПУНО́Ў Васіль Андрэевіч (3.4.1914, в. Чычырына Вожагадскага р-на Валагодскай вобл. — 25.12.1978), бел. вучоны ў галіне жывёлагадоўлі. Д-р с.-г.н. (1969), праф. (1971). Скончыў Кіраўскі зоавет. ін-т (1938). З 1955 у Бел. НДІ жывёлагадоўлі (заг. аддзела), з 1963 у Бел. ін-це механізацыі сельскай гаспадаркі (дацэнт, праф., заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях кармлення с.-г. жывёл, тэхналогіі нарыхтоўкі і перапрацоўкі кармоў.

САПФІ́ЗМ, тое, што *лесбіянства*.

САПФІ́Р (грэч. sappheiros ад стараж.-яўр. — сапір, магчыма, ад стараж.-інд. sanipгіуа літар. — любімы Сатурнам), мінерал, празрыстая разнавіднасць *карунду* любога колеру, акрамя чырвонага (гл. *Рубін*). Сінганія трыганальная. Крышталі выцягнутыя бочкападобныя або дыпірамідальныя. Колер пераважна сіні, а таксама фіялетавы, жоўты, аранжавы (падпараджа), зялёны, ружовы або бясколерны (лейкасапфір). Утвараецца як магматычны мінерал у выглядзе парфіравых украпанікаў у базальтах, лампрафірах, шчолачных пегматытах і пры гідратэрмальна-метасаматычных працэсах. Прамысл. радовішчы — элювіяльныя, элювіяльна-дэлювіяльныя і алювіяльныя россыпы. Прыродны сіні С. — каштоўны камень 1-га парадку, астатнія

Сапфір.

колерныя разнавіднасці — 2-га парадку. Сінтэзуецца ў прамысл. маштабах. Выкарыстоўваецца ў ювелірнай справе, лейкасапфіры — у эл.-тэхн. прам-сці. Радовішчы ў Індыі, Бірме, Танзаніі, Аўстраліі, ЗША і інш.

САПФІ́ЧНАЯ СТРАФА́, від 4-радковай антычнай страфы, што складаецца з трох 11-складовых лагаэдычных радкоў (гл. *Лагаэд*) і чацвёртага 5-складовага. Названа ў гонар стараж.-грэч. паэтэсы *Сапфо*, якая вынайшла страфу і шырока карысталася ёю. С.с. імкнуўся імітаваць у некат. вершах Сімяон Полацкі. У сучаснай паэзіі ўдалыя ўзоры імітацыі С.с. трапляюцца ў У.Дубоўкі:

Вечар... П'яны вечар сваволі-траўня...
Вецер косы ночы расплёў, дуронік...
Салавей пяе над ракой, як слаўна!..
Сны сніць сасоннік...
Гукі тыя, здані той цёмнай ночы
Кроў крынічаць... Млосць захапляе волю...
Спакусіцель-чорт з нас трубой рагоча:
«Дзе ж твая доля?»

(«Здані»).

В.П.Рагойша.

САПФО́, Сафо (грэч. Psappho, лац. Sappho; канец 7 ст. да н.э., г. Эрэс, Грэцыя — 1-я пал. 6 ст. да н.э.), старажытнагрэчаская паэтэса. У г. Мітылене (в-аў Лесбас) кіравала культавым аб'яднаннем, прысвечаным музам, харытам, Афрадыце: вучыла знатных дзяўчат з усёй Грэцыі і М.Азіі паэзіі, музыцы, танцам, добрым манерам, рыхтуючы іх да замужжа. Гал. тэмы яе лірыкі — каханне, захапленне хараством сябровак, радасць стасункаў з імі і горыч разлукі, прыгажосць прыроды і ўсяго свету. Адкрыла ў паэзіі свет асабістых перажыванняў, моцных і страсных, пераважна журботных, пачуццяў. Стварала для хароў вясельныя песні (эпіталамы), звязаныя з

фальклр. паэтыкай. Пісала на эалійскім дыялекце, выкарыстоўвала розныя метрычныя формы, самая вядомая з якіх — *сапфічная страфа*. У антычнасці вершы С. былі выдадзены ў 9 кнігах. Поўнасцю захаваўся 1 верш, астатнія ў фрагментах. Іх уплыў зазналі Катул і Гарацый. На бел. мову асобныя яе вершы пераклаў Л.Баршчэўскі.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Літаратура народаў свету. Ч.1. Мн., 1995; Рус. пер. — у кн.: Античная лирика. М., 1968; У кн.: Парнас: Антология антич. лирики. М., 1980.

Літ.: Толстой И.И. Сапфо и тематика ее песен // Статьи о фольклоре. М.; Л., 1966; Ярхо В.Н., Полонская К.П. Античная лирика. М., 1967; Боннар А. Греческая цивилизация: Пер. с фр. М., 1995.

С.Дз.Малюковіч.

САРАБА́НДА (ісп. zarabanda), 1) старадаўні танец ісп. паходжання. Вядомы з 16 ст. як хуткі, свавольны, тэмпераментны песня-танец любоўнага характару. З 17 ст. пашырыўся ў Англіі і Францыі і ператварыўся ў павольны прыдворны танец урачыстага характару. 2) З сярэдзіны 17 ст. — частка інстр. *сюіты*. Жанравыя прыкметы: тэмп павольны, памер 3/4 або 3/2 з акцэнтам на 2-й долі такта, развітае гарманічнае суправаджэнне, шырокае выкарыстанне арнаментыкі; характар урачысты або журботна-засяроджаны, часам жалобны. Лепшыя ўзоры створаны І.С.Бахам і Г.Ф.Гендэлем. У 20 ст. кампазітары выкарыстоўваюць С. ў творах неакласічнай арыентацыі (сюіта «Для фартэпіяна» і фп. «Вобразы» К.Дэбюсі, балет «Агон» І.Стравінскага). У бел. музыцы выкарыстана Я.Глебавым для стварэння вобраза Філіпа ў балеце «Тыль Уленшпігель», У.Дарохіным у сімф. сюіце «Мемарыял», у якой кампазітар пераасэнсоўвае прынцыпы будовы класічнай сюіты, В.Войцікам як частка «Сюіты ў старадаўнім стылі». *А.У.Валадковіч.*

САРАГА́Т (Saragat) Джузепе (19.9.1898, г. Турын, Італія — 11.6.1988), італьянскі дзярж. і паліт. дзеяч. Скончыў Турынскі ун-т. З 1922 у італьян. сацыяліст. руху, адзін з лідэраў яго правага крыла. Заснавальнік (1947), ген. сакратар (1949—54, 1957—64, 1976), старшыня (з 1984) Італьян. с.-д. партыі (да 1951 Сацыяліст. партыя італьян. працоўных). Неаднаразова (з 1944) міністр, у 1947—49 і 1954—57 нам. прэм'ер-міністра ўрада. Прэзідэнт Італіі ў 1964—71. Праводзіў левацэнтрысцкі ўнутрыпаліт. курс, у знешняй палітыцы імкнуўся падтрымліваць добрыя адносіны і з краінамі НАТО, і з СССР. З 1971 пажыццёвы сенатар.

САРАГО́СА (Zaragoza), горад на ПнУ Іспаніі, на р. Эбра. Адм. ц. аўтаномнай вобласці Арагон і прав. Сарагоса. Каля 650 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд., у т.л. прылада- і аўтамабілебудаўнічая, вытв-сць чыгуначнага, с.-г., эл.-тэхн. абсталявання; харч., хім., тэкст., дрэваапр., коркавая, цэм., гарбарна-абуткавая. Канцавы пункт нафтаправода Рота — С. Ун-т. Штогадовыя прамысл. кірмашы.

Засн. ў 27 да н.э. на месцы іберыйскага паселішча як рым. калонія пад назвай Цэзарэя-Аўгуста. У 452 н.э. захоплена *свевамі*, у 476 — вестготамі. У 714—1118 пад уладай арабаў, у 11 — пач. 12 ст. цэнтр Сарагоскага эмірата. У 1118 горад адваяваны ў арабаў войскамі караля Арагона Альфонса I, з 1119 сталіца Арагонскага каралеўства, атрымала права самакіравання і інш. прывілеі. У 14—16 ст. адзін з важнейшых эканам. (вытв-сць сукна) і культ. (у 1474 засн. ун-т) цэнтраў Арагона. У 17—18 ст. эканамічна заняпала. У 1-ю ісп. рэвалюцыю 1808—14 (гл. ў арт. *Іспанскія рэвалюцыі 19 стагоддзя*) двойчы ўзята ў аблогу франц. войскамі (1808, 1808—09). У *Іспанскую рэвалюцыю 1931—39* месца баёў паміж рэсп. войскамі і франкістамі.

У структуры цэнтра горада захаваліся рысы рэгулярнай планіроўкі стараж.-рым. калоніі. Сярод помнікаў: рэшткі стараж.-рым. пабудоў, маўрытанскіх будынкаў (10—12 ст.) з узорыстай цаглянай муроўкай, дэкар. купаламі, абліцоўкай шматколернай кафляй, сабор Ла-Сеа (1119—1550; фасад канца 17 ст. ў стылі эрэрэска; вежа 1685), касцёлы ў стылі мудэхар (Санта-Марыя Магдалена і інш.), біржа («лонха», 1551, готыка і платэрэска), палацы 16 ст. ў стылі платэрэска. У С. — правінцыяльны музей прыгожых мастацтваў.

САРА́ЕВА (Sarajevo), горад, сталіца Босніі і Герцагавіны. Каля 600 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Паліт., гандл. і прамысл. цэнтр краіны. Прам-сць: маш.-буд., у т.л. аўтабуд., эл.-тэхн., радыёэлектронная; хім., тэкст., гарбарна-абутковая, дрэваапр., харчасмакавая. Саматужны выраб дываноў і рамёствы. Акадэмія навук і мастацтваў Босніі і Герцагавіны. Ун-т. Музей Босніі і Герцагавіны. Маст. галерэя. Паблізу — курорт Іліджа. С. — цэнтр зімовых відаў спорту.



Сараева. Мячэць Хусрэў-бега. 1513.

Упершыню згадваецца ў 1244 пад назвай Врхбосна. У 1435 заваяваны туркамі-асманамі. З 1507 наз. С. На гэты час прыпадае росквіт горада як гандл. і рамеснага цэнтра. У 17—19 ст. неаднаразова зруйнаваны пажарамі. З сярэдзіны 19 ст. адм. і паліт. ц. басній-

скага намесніцтва Асманскай імперыі. У 1878—1908 гал. горад Босніі, акупіраванай Аўстра-Венгрыяй. У 1908—18 адм. ц. правінцыі Боснія і Герцагавіна. 28.6.1914 у С. забіты аўстр. наследнік прастола Франц Фердынанд (гл. *Сараеўскае забойства*). Са снеж. 1918 у складзе Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 Югаславія). У 2-ю сусв. вайну акупіраваны ням.-фашыстамі (1941—45). Адзін з цэнтраў *Народна-вызваленчай вайны ў Югаславіі 1941—45*. З 1946 сталіца Босніі і Герцагавіны. У 1984 у С. адбыліся XIV зімовыя Алімпійскія гульні.

Каларыт старога горада ствараюць пабудаваныя паводле ўсх. традыцыі кварталы са шчыльнай планіроўкай. Захавалася сярэдневяковая Старая царква з абразамі 15—17 ст. Узоры рэгіянальнага варыянта класічнага стылю тур. архітэктуры: мячэці Хусрэў-бега (1531) з мінарэтам выш. 45 м (арх. Сінан), Алі-Пашы (1561), Царова (1566) і інш., медрэсэ Хусрэў-бега (1537) і інш. Адметныя крытыя базары 16 ст. — паўпадземны безістэні Хусрэў-бега (1557, даўж. 109 м), купальны Бруса-безістэні (1557), каменныя масты — Козі (да 1550), Лацінскі (да 1565), Шэхерчэхайін (1620). З 2-й пал. 19 ст. ўзводзіліся жылая забудова і грамадскія будынкі ў аўстр. арх. стылях (гістарызм, сецэсіён) з выкарыстаннем усх. (ратуша, кафедральны каталіцкі сабор) і класічных матываў (Прэзідыум урада, чыг. ўпраўленне, Мін-ва фінансаў, т-р, музей). Пабудовы 1918—45 і 2-й пал. 20 ст. ў духу функцыяналізму: банкі, Вышэйшая пед. школа, чыг. вакзал, новыя карпусы ун-та, аэрапорт, кансерваторыя, турыстычныя атэлі. Паводле генплана 1963 створаны новыя раёны (Габрычава), культ.-спарт. цэнтр «Скендэрыя», Музей нар. рэвалюцыі; спарт. збудаванні XIV зімовых Алімп. гульняў 1984. У выніку ваен. дзеянняў пач. 1990-х г. архітэктура С. пражыла цяжкія разбурэнні і пашкоджанні.

Я.Ф.Шунейка (архітэктура).

САРА́ЕЎСКАЕ ЗАБО́ЙСТВА, забойства наследніка аўстр. прастола эрцгерцага Франца Фердынанда 28.6.1914 у г. *Сараева* (Боснія). Здзейснена членамі тайнай групы сербскай нац. арг-цыі «Маладая Боснія» на чале з Г.*Прынцыпам* і Д.Ілічам. План забойства распрацавала з ведама сербскага ўрада блізкая да сербскага ген. штаба тайная арг-цыя «Аб'яднанне або смерць» («Чорная рука»). Франц Фердынанд, разам з жонкай, быў застрэлены Прынцыпам у час руху па вуліцах Сараева, куды ён прыбыў для кіраўніцтва манеўрамі аўстравенг. арміі. Іліч і 2 інш. члены тэрарыст. групы пакараны смерцю, Прынцып (як непаўналетні) асуджаны на 20 гадоў катаргі (памёр у турме). С.з. было выкарыстана Аўстра-Венгрыяй і Германіяй як падстава для ваен. нападу на Сербію, што стала пачаткам 1-й сусв. вайны.

САРА́Й-БАТУ́, Старый Сарай (паводле летапісу Сараі Вялікія;

цяпер с. Сялітранае Харабалінскага р-на Астраханскай вобл. Расіі), горад, першапачаткова галоўны паліт. цэнтр *Залатой Арды*. Пабудаваны ханам *Батыем* у 1254. У С.-Б. было шмат палацаў, мячэцей, рамесніцкія кварталы (Глінянае поле); каля горада — вял. некропаль. У выніку міжусобнай барацьбы ханаў і паходу *Цімура* (1395) моцна пацярпеў. Канчаткова разбураны ў 1480. У 18 ст. на месцы горада быў салетравы завод. У 1922, 1931 праводзіліся раскопкі.

САРА́Й-БЕРКЕ́, Новы Сарай (цяпер с. Цароў Ленінскага р-на Валгаградскай вобл.), горад, сталіца *Залатой Арды*. Пабудаваны ханам Берке каля 1260. Найб. росквіту дасягнуў у 1-й пал. 14 ст. Пасля 1361 горад захоплівалі розныя прэтэндэнты на ханскі прастол. У 1395 разбураны *Цімурам*. У 1843—51, 1922, 1959—67 праводзіліся раскопкі.

САРА́ЙЧЫК, Сарай Малы (цяпер с. Сарайчыкаўскае Махамбецкага р-на Атыраўскай вобл., Казахстан), горад Залатой Арды на стараж. гандл. шляху з Ніжняга Паволжа ў *Харэзм*. У 1395 разбураны войскамі *Цімура*. Пазней адноўлены; паліт. цэнтр Нагайскай Арды. Канчаткова зруйнаваны казакамі ў 1580.

САРАКА́БА (Sorocaba), горад на ПдУ Бразіліі, у штаце Сан-Паўлу, у даліне р. Саракаба. Засн. ў 1589. Каля 400 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: каляровая і чорная металургія, тэкст., цэм., гарбарна-абутковая, хім., эл.-тэхн., вінна-гарэлачная. Гіст. музей.

САРАКІ, у беларусаў веснавое свята нар. календара. Правасл. царква прымеркавала да яго дзень 40 пакутнікаў (адзначалася 9 сак. с. ст.). Лічба 40 часта абыгрывалася ў павер'ях і абрадавых дзеяннях. Дзяўчаты на С. пераломвалі 40 дошчачак і разрывалі 40 вяровачак (сімвалізавалі, відаць, сілы, што скоўвалі зямлю), каб наблізіць надыход цяпла, абудзіць ад зімовага сну ўсю жывую прыроду. Калі на С. здараўся мароз, то чакалі яшчэ 40 маразоў і за кожным з іх з'ядалі па аднаму з 40 хлебных шарыкаў, спечаных да свята. На С. звычайна чакалі пацяплення, «адпушчэння» дрэў і прылёту птушак. Калі ад грамніц да С. трымалася добрае сухое надвор'е, то летам чакалася засуха. *У.А.Васілевіч.*

САРАКУ́ШЫ (Saniidae), сямейства птушак атр. вераб'іных. Больш за 60 відаў, пашыраны ў Еўразіі, Паўн.-Зах. Афрыцы, Паўн. Амерыцы. На Беларусі 4 віды: жулан, С. чарналобы, С. шэры, С. чырвонагаловы. Пералётныя птушкі. Жывуць у садах, парках, гаях, хмызняках. С. чарналобы і С. шэры занесены ў Чырв. кнігу Беларусі.

Даўж. цела жулана да 20 см, маса каля 30 г. Галава і шыя шэрыя, спіна рыжавата-каштанавая, каля вачэй чорная папярочная палоска. Хвост доўгі, ступеньчаты. Даўж. С. шэрага каля 25 см, маса 68—75 г. Апярэнне зверху шэрае, знізу белаватае, хвост чорны з белым пер'ем па краях, крылы чорныя. Чарналобы С. меншы (маса 47—53 г), адрозніваецца ад шэрага чорным ілбом. Апярэнне мяккае, крылы кароткія, круглаватыя, хвост доўгі. Дзюба кручком. Кладка — 4—6 яец. Корміцца насякомымі, іх лічынкамі, дробнымі паўзунамі, грызунамі, зрэдку птушкамі.

1

2

Саракушы: 1 — саракуш шэры; 2 — жулан.

САРАМА́ГУ (Saramago) Жазэ (н. 16.11.1922, Азіньяга, каля г. Сантарэн, Партугалія), партугальскі пісьменнік. Дэбютаваў зб. паэзіі «Паэмы магчымага» (1966). Вядомасць яму прынеслі раманы, прысвечаныя рэліг. або гіст. праблематыцы: «Надзея ў Алентэжу» (1980), «Напамін пра кляштар» (1982), «Год смерці Рыкарду Рэйша» (1984), «Паток камянёў» (1986), «Гісторыя аблогі Лісабона» (1989), «Евангелле паводле Ісуса Хрыста» (1991), «Горад слепых» (1997) і інш., у якіх элементы традыц. рэалізму спалучаюцца са шматлікімі эксперыментамі ў мове і форме. Аўтар п'ес, у т.л. «Другое жыццё Францыска Асізскага» (1987). Нобелеўская прэмія 1998.

Тв.: Рус. пер. — Поднявшиеся с земли. М., 1982; Воспоминания о монастыре. М., 1985; Евангелие от Иисуса. М., 1999.

Л.П.Баршчэўскі.

САРА́НСК, горад, сталіца Мардовіі, у Расіі, на левым беразе р. Інсар (бас. р. Волга). Засн. ў 1641 як крэпасць на паўд.-ўсх. мяжы Расійскай дзяржавы. 318 тыс. ж. (1999). Чыг. станцыя. Вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: машынабудаванне і металаапрацоўка (у т.л. эл.-тэхн., прыладабудаўніцтва, выт-сць экскаватараў, аўтасамазвалаў, тэлевізараў; з-ды: мех., мед. абсталявання і прэпаратаў, кабельны і інш.), хім.-фармацэўтычная і хім., харч., лёгкая. 2 ВНУ, у т.л. Мардоўскі ун-т. 3 тэатры: драмы, муз. камедыі, лялек. Філармонія. Музеі: краязн., карціннай галерэя, скульптара С.Дз.Эрзі. Арх. помнікі: царква Іаана Багаслова (канец 17 ст.), мураваныя палаты (т. зв. Пугачоўская палатка, 17 ст.) і інш.

САРАНЧА́НЫ, Серанчаны, возера ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Страча, за 27 км на ПдЗ ад г. Паставы. Пл. 0,68 км^2, даўж. 1,6 км, найб. шыр. 600 м, найб. глыб. 3,5 м, даўж. берагавой лініі 5,6 км. Пл. вадазбору 45,6 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу. Схілы выш. 2—3 м (на ПдЗ 6—8 м), параслі лесам і хмызняком. Пойма шыр. 5—10 м, пад хмызняком. Берагі нізкія, месцамі сплавінныя, на У участкамі выш. да 0,7 м. Востраў пл. 0,4 га. Дно да глыб. 1 м пясчанае, ніжэй сапрапелістае. Зарастае. Упадае ручай з воз. Лодасі, выцякае ручай у р. Страча.

САРАНЧО́ВЫЯ (Acridoidea), надсямейства караткавусых насякомых атр. *прамакрылых*. У сусв. фауне больш за 10 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды. Адрозніваюць статкавых (саранча) і нястаткавых С. (*кабылкі*, тэтрыгідавыя). На Беларусі каля 50—70 відаў. Насякомыя адкрытых ландшафтаў. Большасць раслінаедныя. Шкоднікі пасеваў, пашы, сенажацей.

Даўж. ад некалькіх мм да 10 см. Цела карычневае, зеленаватае, жаўтаватае, жаўтаватае з разнастайным малюнкам. Ротавыя органы грызучыя. Вусікі не большыя за палавіну даўж. цела. Заднія ногі з патоўшчанымі сцёгнамі, скакальныя. Крылы пярэднія скурыстыя, заднія перапончатыя (у некат. яркаафарбаваныя, напр., чырв. ў агнёўкі). У многіх відаў крылы кароткія або рэдукаваныя. Брушка членістае, у самцоў з нячленістымі прыдаткамі — цэркамі, у самак з кароткім яйцакладам. У многіх відаў развіты слыхавы і гукавы апарат. Яйцы адкладваюць у глебу. Развіццё з няпоўным ператварэннем. За год 1 пакаленне. Лічынкі вылупляюцца вясной, ад дарослых насякомых адрозніваюцца памерамі і зачаткавымі крыламі. Зімуюць яйцы, лічынкі старэйшых узростаў, дарослыя насякомыя.

САРА́ПУЛ, горад, цэнтр Сарапульскага р-на Рэспублікі Удмурція, у Расіі. Вядомы з 16 ст. 106 тыс. ж. (1999). Порт на р. Кама. Чыг. станцыя. Вядучая галіна прам-сці — машынабудаванне. З-ды: маш.-буд., электрагенератарны, «Электрабытпрыбор», радыёзавод; гарбарны камбінат, мэблевая, абутковая і швейная ф-кі. Харч. прадпрыемствы. Дрэваапрацоўка. Драм. тэатр. Музей гісторыі і культуры Сярэдняга Прыкам'я.

СА́РАС (грэч. saros), прамежак часу, цераз які паўтараюцца ў адной і той жа паслядоўнасці сонечныя і месяцавыя

зацьменні. Быў вядомы ў Егіпце і Грэцыі ўжо за некалькі стагоддзяў да н.э. Абумоўлены перыядычным паўтарэннем узаемнага размяшчэння Сонца, Месяца і вузлоў месяцавай арбіты на нябеснай сферы. Прыблізна роўны 6585 $^1/_3$ сут. На працягу аднаго С. бываюць 43 зацьменні Сонца і 28 зацьменняў Месяца (у розныя перыяды іх колькасць можа некалькі мяняцца).

САРАСА́ТЭ, Сарасатэ-і-Наваскуэс (Sarasate y Navascuéz) Пабла дэ (Пабла Марцін Мелітан; 10.3.1844, г. Памплона, Іспанія — 20.9.1908), іспанскі скрыпач, кампазітар; адзін з найбуйнейшых скрыпачоў-віртуозаў. Скончыў Парыжскую кансерваторыю (1857). З 1859 вёў гастрольную дзейнасць. У канцы 1860-х г. арганізаваў стр. квартэт у Парыжы, з якім канцэртаваў у многіх краінах, у т.л. ў Расіі (з 1869). Іграў у ансамблях з піяністамі А.Р. і М.Р. Рубінштэйнамі, скрыпачамі Г.Вяняўскім і Л.Аўэрам, віяланчэлістамі К.Давыдавым і А.Вержбіловічам. У Парыжы быў пастаянным удзельнікам т.зв. чацвяргоў у І.Тургенева. З вял. поспехам выконваў асабістыя творы, у якіх яскрава праявіўся нац. стыль. Аўтар твораў для скрыпкі з фп., у т.л. «Арагонская хота», канцэртнай фантазіі на тэмы класічных опер і інш. Каралевай Ізабелай быў узнагароджаны адной з лепшых скрыпак А.Страдывары.

СА́РАСВАТЫ, у старажытнаіндыйскай ведыйскай міфалогіі (гл. *Веды*) гал. рака сусвету і яе багіня. Паўнаводная і магутная С. ачышчае і лечыць, нясе дары, ежу, патомства, жыццёвую сілу і бессмяротнасць. Яна — багіня свяшчэннай мовы і апякунка спевакоў. У пасляведыйскую эпоху С. — багіня красамоўства і мудрасці, жонка *Брахмы*, вынаходніца *санскрыту*, апякунка мастацтваў і навук.

Сарасваты. Базальт. 11 ст. Бенгалія.

САРА́ТАЎ, горад, цэнтр Саратаўскай вобл. ў Расіі. Засн. ў 1590 як умацаваны пункт на паўд.-ўсх. межах Расіі. 874 тыс. ж. (1999). Порт на р. Волга (Валгаградскае вадасх.). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: машынабудаванне (з-ды станкабуд., авіяц., энергет., электроннага машынабудавання, падшыпнікавы, дызельны і інш.), эл.-тэхн., нафтаперапр., хім., дрэваапр., харч., лёгкая. З-д тэхн. шкла. 10 ВНУ, у т.л. ун-т, кансерваторыя. 4 тэатры, у т.л. тэатр оперы і балета. Цырк. Планетарый. Музеі: краязн., мастацкі, М.Г.*Чарнышэўскага*, К.А.*Федзіна*, Музей-кватэра сям'і Ульянавых. Троіцкі сабор (17 ст.), грамадскія і жылыя будынкі 1-й пал. 19 ст.

САРА́ТАЎСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на ПдУ еўрап. ч. Расійскай Федэрацыі, у Ніжнім Паволжы. Утворана 10.1.1934. Пл. 100,2 тыс. км^2. Нас. 2907 тыс. чал. (2000), гарадскога 73%. Цэнтр — г. *Саратаў*. Найб. гарады: Балакова, Энгельс, Балашоў, Вольск.

Вобласць падзяляецца р. Волга на 2 часткі: зах. (правабярэжную) і ўсх. (левабярэжную, Заволжа). Б.ч. правабярэжжа займае Прыволжскае ўзв. (выш. да 370 м), на З — Окска-Данская раўніна. Левабярэжная частка раўнінная, з У і ПнУ абмежавана адгор'ямі Агульнага і Каменнага Сырта. На ПдУ — ч. Прыкаспійскай нізіны. Паверхня моцна парэзана ярамі. Карысныя выкапні: прыродны газ, нафта, гаручыя сланцы, калійна-магнезіяльныя солі, фасфарыты, сыравіна для буд. матэрыялаў. Клімат кантынентальны, засушлівы. Сярэдняя т-ра студз. -12°С, ліп. 21,7°С. Ападкаў за год ад 250 мм на ПдУ да 450 мм на Пн. Гал. р. Волга (у межах вобласці 420 км) з прытокамі Церашка (справа), Вял. і Малы Іргіз (злева); найб. прытокі р. Дон — Хапёр і Мядзведзіца, рэкі Вял. і Малы Узень у Заволжы. Валгаградскае і Саратаўскае вадасховішчы. Саратаўскі і Ерусланскі абвадняльныя каналы. Каля 80% тэр. вобласці ў стэпавай зоне з чарназёмнымі глебамі, у Заволжы пашыраны каштанавыя і светла-каштанавыя глебы. Лясістасць 5,5% (вяз, дуб, бяроза). Хвалынскі нац. парк.

Асн. галіна эканомікі — прамысловасць, дзе вылучаюцца машынабудаванне і металаапрацоўка (20,1% кошту прадукцыі, 1999). Вытв-сць самалётаў, тралейбусаў, станкоў, электрарухавікоў, акумулятараў, прылад, падшыпнікаў, дызеляў, аўтатрансп. прычэпаў, запчастак для аўтамабіляў, халадзільнікаў і маразільнікаў; аўтарамонт. Паліўна-энергет. комплекс (29%) прадстаўлены здабычай прыроднага газу (367 млн м^3), нафты і кандэнсату (1,5 млн. т), вытв-сцю электраэнергіі (31,1 млрд. кВт · гадз, 1999). Саратаўская ГЭС, Балакоўская АЭС. Развіта хім. і нафтахім. (штучнае і сінт. валакно, мінер. ўгнаенні, серная к-та, гумава-тэхн. вырабы), буд. матэрыялаў (цэмент, шыфер, вапна, мел, тэхн. шкло, цэгла і інш.), дрэваапр., лёгкая (трыкат., абутковая, швейная, вытв-сць шаўковых і баваўняных тканін), харч. прам-сць. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, птушкагадоўлі, вырошчванні збожжа. У структуры сельскай гаспадаркі 81% прыпадае на прадукцыю жывёлагадоўлі. Пасяўныя пл. займаюць 4,4 млн. га, у т.л. пад збожжавымі культурамі 72% (пшаніца азімая і яравая, ячмень, проса, жыта), тэхн. 9,4% (сланечнік, цукр. буракі), кармавымі 17,3%. Вырошчваюць бульбу і агародніну. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак і коз, птушак. Даўж. чыгунак 2312 км; асн. чыгункі Масква—Саратаў—Арэнбург, Валгаград—Казань. Даўж. аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 9828 км (Саратаў—Варонеж, Саратаў—Пенза і інш.). Суднаходства па Волзе і Вял. Іргізе. Парты: Саратаў, Энгельс, Вольск, Балакова. Буйн. газаправоды: Саратаў—Масква, Саратаў—Пенза—Ніжні Ноўгарад—Чарапавец, Сярэдняя Азія—Цэнтр. Курорт імя В.І.Чапаева.



САРА́ТАЎСКІ УНІВЕРСІТЭ́Т імя М.Г.Чарнышэўскага, адзін са старэйшых ун-таў Расіі, буйны адукацыйны і навук. цэнтр. Засн. ў 1909, з 1921 імя Чарнышэўскага. У 2000/01 навуч. г. больш за 22 тыс. студэнтаў і 1,5 тыс. выкладчыкаў; 19 ф-таў, у т.л. фіз.; хім.; механіка-матэм.; філал.; біял.; геагр.; геал.; філас.; гіст.; гуманіт. і сац. навук; камп'ютэрных навук. і інфарм. тэхналогій; сацыялогіі; нелінейных працэсаў і інш. Аспірантура з 1925. Дактарантура з 1992. Працуюць 15 спецыялізаваных саветаў па абароне дысертацый. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае. У складзе ун-та Балашоўскі і Астраханскі філіялы; ін-ты — пед., Міжрэгіянальны грамадскіх навук, дадатковай прафес. адукацыі, Ін-т «Адкытыя сістэмы»; каледж радыёэлектронікі; палітэхнікум; 4 НДІ (механікі і фізікі; геалогіі; хіміі; рус. мовы, л-ры і журналістыкі); Паволжскі рэгіянальны цэнтр новых інфарм. тэхналогій (у 1988 на яго базе створаны Цэнтр Інтэрнет), Цэнтр тэсціравання, Цэнтр міжнар. супрацоўніцтва і акад. мабільнасці, Цэнтр нелінейнай дынамі-

П.І.Рогач.

кі і біяфізікі, Цэнтр еўрап. саюза, Цэнтр усходазнаўства, Цэнтр перспектыўных навук. даследаванняў; Занальная навук. б-ка (больш за 3 млн. экз. кніг; мае доступ да сусветных баз даных), бат. сад і інш.

САРАФА́Н (цюрк., ад перс. серапа — ганаровае адзенне), рускае нац. жаночае адзенне — сукенка, звычайна без рукавоў, якую апраналі паверх кашулі. У дапятроўскай Русі С. насілі ў баярскім асяродку, у 19 ст. — гал. чынам сялянкі ў паўн. і цэнтр. абласцях Расіі, у Паволжы, Сібіры, а таксама некат. гараджанкі. Найб. стараж. тып С. — без разрэзу

Касцюм маладой дзяўчыны з **сарафанам**. Архангельская губерня. Расія. Пач. 19 ст.

спераду, з шырокімі проймамі, часам з несапраўднымі адкіднымі рукавамі. У сярэдзіне 19 ст. быў пашыраны С., сшыты з касых кліноў, які зашпільваўся спераду на гузікі; пазней — С. прамога крою на лямках, а таксама адразны С., які складаўся з ліфа і спадніцы. У пач. 20 ст. выйшаў з ужытку. На Беларусі адразны С. вядомы ў *краснапольскім строі*.

САРАФА́НАЎ Генадзь Васілевіч (н. 1.1.1942, с. Сіненькія Пятроўскага р-на Саратаўскай вобл., Расія), савецкі касманаўт. Герой Сав. Саюза (1974). Лётчык-касманаўт СССР (1974), палкоўнік. Скончыў Балашоўскае вышэйшае ваен. авіяц. вучылішча лётчыкаў (1964). У 1965—86 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў. 26—28.8.1974 з Л.С.*Дзёміным* здзейсніў (як камандзір) палёт на касм. караблі «Саюз-15». Правёў у космасе 2,2 сут.

САРАХАТЎНАЎ Барыс Канстанцінавіч (н. 28.11.1924, Тбілісі), расійскі рэжысёр. Засл. дз. маст. Расіі (1966). Скончыў Усесаюзны ін-т кінематаграфіі (1951, педагог А.Даўжэнка). З 1951 працаваў на Далёкаўсх. студыі кінахронікі, з 1969 маст. кіраўнік вытв. аб'яднання «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм», з 1979 на Рас. цэнтр. студыі хранікальных і дакумент. фільмаў. Лепшым фільмам уласцівы праблемны падыход да тэматыкі, арган. спалучэнне розных часавых пластоў з выкарыстаннем мастацтва рэпартажных здымак. На студыі «Беларусьфільм» стварыў фільмы па ўласных сцэнарыях: «Бронзавы салдат» (1970), «Памятай!» (1972), «Дзіяна беларускіх лясоў» (сцэн. з А.Васільевым), «Добры дзень, Беларусь!», «Адзінаццаты раунд» (усе 1973), «Шлях да Арыёна» (1974), «Вялікая вада на Брэстчыне» (1975), «Добрая зямля», «І днём, і ноччу» (1977), «Строгі рахунак» (1978), «Гарачыя травы» (1979), «Вахта памяці. Мінск—1984» (1984). *А.А.Лабовіч.*

САРАЧА́НКА, Клевель, рака ў Астравецкім р-не Гродзенскай вобл., правы прыток р. Вілія. Даўж. 29 км. Пл. вадазбору 201 км^2. Выцякае з воз. Тумскае. За верхняе цячэнне лічаць р. Клевель, якая пачынаецца за 1,7 км на ПдЗ ад в. Караняты і дрэніруе азёры Баранскае, Клевел, Белае, Туравейскае, Залаўскае, Каймін, Тумскае. Упадае ў Вілію за 1 км на З ад в. Сарочча. Рэчышча ад вытоку на працягу 2,2 км каналізаванае.

САРАЧА́НСКАЯ ГРУ́ПА АЗЁР. У Астравецкім р-не Гродзенскай вобл., у бас. р. Вілія. Уключае 12 азёр агульнай пл. 4,3 км^2 (пл. вадазбору 180 км^2): Тумскае, Ёдзі, Вераб'і, Каймін, Туравейскае, Белае, Галадзянка, Залаўскае,

Гульбеза, Баранскае, Галодна, Клевел. Азёры займаюць невял. глыбокія ўчасткі агульнай ледавіковай лагчыны (даўж. больш за 20 км), утварэнне якой звязана з выворваннем паазерскага ледавіка і наступнай дзейнасцю расталых ледавіковых вод. У наваколлі азёр марэнныя ўзвышшы (выш. 30—40 м) чаргуюцца з забалочанымі нізінамі, уздоўж азёр выцягнуты озавыя грады, многа камавых узгоркаў, парослых лесам. Для мелкаводных азёр (найб. глыб. да 6 м; Клевел, Вераб'і, Белае, Туравейскае, Галадзянка) характэрна шырокая (да 50—70 м) прыбярэжная пясчаная зона, інтэнсіўнае зарастанне (шыр. паласы расліннасці 40—200 м, Клевел па ўсёй плошчы). Сярэднеглыбокія азёры (глыб. да 21 м; Галодна, Тумскае, Ёдзі і інш.) маюць вузкую прыбярэжную пясчаную зону, нязначнае зарастанне (шыр. паласы расліннасці менш за 30 м). Глыбакаводную ч. азёрных катлавін высцілаюць сапрапелі. Большасць азёр дрэніруюцца р. Клевель (паміж азёрамі мае выгляд шырокіх праток), з Тумскага воз. выцякае р. Сарачанка. Азёры Ёдзі, Гульбеза і Вераб'і злучаны паміж сабой і маюць сцёк у р. Страча. С.г.а. вызначаецца выключнай маляўнічасцю і мае высокія рэкрэацыйныя вартасці.

САРАЧА́НСКІЯ АЗЁРЫ, ландшафтны заказнік рэсп. значэння ў Астравецкім р-не Гродзенскай вобл. Створаны ў 1998 з мэтай захавання прыроднага ландшафту Бел. Паазер'я з папуляцыямі рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл. Пл. 13 тыс. га, у т.л. р. Вілія — 188 га і 14 азёр — 430 га. Размешчаны на стыку Свірскай краявой ледавіковай грады і Вілейскай марэнна-ледавіковай нізіны, што абумоўлівае разнастайнасць рэльефу. Азёры ў глыбока ўрэзаных катлавінах, ахаваныя ад ветру, мелка- і сярэднеглыбокія. Слабае перамешванне вады вядзе да недахопу кіслароду ў прыдонных слаях, утварэнню серавадароду і вял. колькасці жалеза. Лясістасць заказніка 75%. Пераважаюць хвойнікі імшыстыя і чарнічныя, трапляюцца ельнікі і бярэзнікі чарнічна-кіслічныя, алешнікі папарацевыя; зрэдку — дуб і асіна. Балотна-лугавая расліннасць складае 15%. У флоры шмат гаспадарча карысных раслін. Кураслеп лясны, ядрушка даўгарогая, пустапялёснік зялёны і ятрышнік дрэмлік занесены ў Чырв. кнігу. У фауне 203 віды жывёл, з якіх 26 занесены ў Чырв. кнігу: буры мядзведзь, рысь, барсук, соні арэшнікавая і садовая, гагара чорнаваллёвая, бугаі малы і вялікі, бусел чорны, журавель шэры, скапа, каршачок, сава балотная, начніца сажалкавая, рапуха чаротная,

мядзянка, стронга ручаёвая, харыус і інш. *П.І.Лабанок.*

САРАЧЫ́, вёска ў Любанскім р-не Мінскай вобл., каля р. Арэса, на аўтадарозе Любань—Камаровічы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 2 км на ПдУ ад г. Любань, 154 км ад Мінска, 27 км ад чыг. ст. Урэчча. 1432 ж., 486 двароў (2001). Участак электрасетак, праўленне раённага спажывецкага т-ва, лесапільня, млын. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, басейн, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

САРАЧЫ́НСКІ Леанід Васілевіч (н. 2.12.1937, в. Блонь Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне земляробства. Д-р с.-г. н. (1994). Скончыў Гродзенскі с.-г. ін-т (1965). З 1971 у Бел. НДІ аховы раслін (з 1976 заг. лабараторыі, з 1980 нам. дырэктара), з 1999 гал. рэдактар час. «Ахова раслін». Навук. працы па пытаннях аховы раслін ад шкоднікаў, хвароб і пустазелля пры інтэнсіўным земляробстве, а таксама на прысядзібных участках, калект. садах і агародах.

Тв.: Защита растений и урожай. Мн., 1988; Вредители и болезни сада и огорода и меры борьбы с ними на дачных и приусадебных участках. Мн., 1998 (разам з М.І.Пратасавым, В.В.Балотнікавай).

САРАЧЫ́НЫ, у беларусаў і інш. хрысціянскіх народаў памінальны абрад, які адзначаецца на 40-ы дзень (6-ы тыдзень) пасля смерці чалавека. Як і інш. *памінкі*, звязаны з *культам продкаў*. На Беларусі наз. таксама саракавіны, саракі, саракапуст; шасціны. Паводле нар. павер'я, у гэты час душа нябожчыка наведвае родную хату, таму яе прыбіралі ручнікамі, на акно ставілі хлеб-соль і шклянку з вадой. На С. родныя наведваюць магілу памерлага, наладжваюць ў доме жалобны стол, які паходзіць ад стараж. язычніцкай трызны. Сярод абавязковых памінальных страў — *куцця*, *канун* і інш. Асобны прыбор з пітвом і стравай ставяць для памерлага. Неабходнасць адзначаць С. тлумачаць тым, што непамянутая душа асуджана на пакуты і не будзе спрыяць людзям у іх зямных справах. *У.А.Васілевіч.*

САРБЕ́НТЫ [ад лац. sorbens (sorbentis) які паглынае], гл. ў арт. *Сорбцыя*.

САРБЕ́ЎСКІ Мацей Казімір (24.2.1595, в. Сарбева, каля г. Плоцк Мазавецкага ваяв., Польшча — 2.4.1640), новалацінскі паэт, тэарэтык л-ры і школьнага т-ра, тэолаг, філосаф. Скончыў Віленскую езуіцкую акадэмію. Удасканальваў веды ў Германіі і Італіі. У 1612 уступіў у ордэн езуітаў. Выкладаў у Полацкім (1618—20, 1626—27) і Нясвіжскім езуіцкіх калегіумах, у Віленскай езуіцкай акадэміі (1620—22, 1628—35). З 1635 каталіцкі прапаведнік пры двары караля Рэчы Паспалітай Уладзіслава IV. Аўтар зб-каў «Тры кнігі лірычных вершаў» (1625), «Чатыры кнігі лірычных вершаў» (1631), «Лясныя песні» (1637), трактатаў па рыторыцы, паэтыцы і ант. міфалогіі («Пра дасканалую паэзію», «Своеасаблівасць лірыкі», «Аб вартасцях і недахопах элегіі», «Аб трагедыі і камедыі», «Аб фігурах думкі», «Аб вытанчанасці і дасціпнасці» і інш.), якія ўвайшлі ў зб-кі: «Пра дасканалую паэзію, або Вергілій і Гамер» (апубл. 1954), «Лекцыі па паэтыцы» (апубл. 1958), «Багі язычнікаў» (апубл. 1972, усе выд. ў Польшчы на лац. і ў перакладзе на польскую мову). Асноўваючыся на працы ант. аўтараў (Арыстоцель, Платон, Гарацый, Цыцэрон) і аўтараў часоў Адраджэння (Ю.Скалігер, Я.Пантан), распрацоўваў эстэт. пытанні паэзіі, драматургіі, красамоўства, міфалогіі. Яго даследаванні знаходзіліся на ўзроўні лепшых еўрап. прац таго часу і зрабілі ўплыў на выкладанне гэтых навук на Беларусі і Літве. Вершы С. перакладзены на англ., ням., франц. мовы Д.Набароўскім, на польскую мову — У.Сыракомлем.

Літ.: Резанов В.И. Поэтика М.К.Сарбевского...: (К истории рус. драмы). Нежин, 1911; Конан У.М. Полацкі курс паэтыкі М.К.Сарбеўскага (1618—1627 гг.) // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1972. № 1; Яго ж. От Ренессанса к классицизму. Мн., 1978; Яго ж. На скрыжаванні братніх культур: Мацей Казімір Сарбеўскі, 1595—1640 // Вяртання маўклівая споведзь: Постаці творцаў бел. гісторыі ў кантэксце часу. Мн., 1994.

У.М.Конан.

САРБІ́Т, шасціатамны аліфатычны спірт, прадукт узнаўлення D-глюкозы. Ёсць у марскіх водарасцях, пладах рабіны, слівы, яблыні і інш.

Бясколерныя крышталі салодкага смаку. Пры акісленні ў залежнасці ад умоў утварае *глюкозу*, *фруктозу* або сарбозу. D-С. —найб. важны прамежкавы прадукт пры вытв-сці *аскарбінавай кіслаты*. Ужываюць як заменнік цукру.

САРБО́НА (Sorbonne), багаслоўскі калеж і інтэрнат для студэнтаў і выкладчыкаў у 1257—1554 у Лац. кварталe Парыжа (ад імя заснавальніка Р. дэ Сарбона, духоўніка караля Людовіка IX); у 1554—1792 тэалагічны ф-т *Парыжскага універсітэта*. З 17 ст. да 1972 пашыраная другая назва Парыжскага ун-та. Пасля рэарганізацыі апошняга (1972) С. называюцца ун-ты і інш. ўстановы, што знаходзяцца ў цэнтры Лац. квартала Парыжа, паміж Пантэонам і пл. Сент-Мішэль. Рэканструкцыя, праведзеная ў 1885—1901 пад кіраўніцтвам архітэктара П.Ненота, надала С. сучасны выгляд. Ад ансамбля будынкаў С., узведзеных кардыналам А.Рышэлье паводле плана архітэктара Ж.Лемерсье, захавалася толькі капліца. На працягу многіх стагоддзяў С. была цэнтрам філас., рэліг. і паліт. думкі. Яе ўзначальвалі ў розны час Л.Кондэ, А.*Рышэлье*, Дж.*Мазарыні*. Як ВНУ карыстаецца аўтарытэтам ва ўсім свеце. *Э.М.Крайко.*

САРГА́Н звычайны, або атлантычны (Belone belone), рыба сям. сарганавых атр. сарганападобных. Трапляецца ў Чорным і Балтыйскім морах.

Даўж. да 90 см, масса 300—400 г. Цела доўгае, тонкае, сківіцы выцягнутыя, звычайна з клыкападобнымі зубамі. Нераст у прыбярэжнай зоне, сярэдняя пладавітасць каля 15 тыс. ікрынак. Ікрынкі прымацоўваюцца да водарасцей. Корміцца дробнай рыбай. Аб'ект мясц. промыслу.

СА́РГАН Старажытны (Акадскі; акадскае Шарум-кен, Шарукін), акадскі цар. У 24 ст. да н.э. засн. дзяржаву у Двухрэччы з цэнтрам у г. *Акад*. Паходзіў з семіцкага г. Кіш. Перамог шумерскага цара Лугальзагісі і заваяваў усе гарады-дзяржавы Двухрэчча. Армія С. дасягнула Элама, Сірыі, М. Азіі. Пры С. храмавыя гаспадаркі былі злучаны з царскімі. Дзяржава С. была першай спробай стварэння цэнтралізаванай дэспатыі.

СА́РГАН II (акадскае Шарукін), цар Асірыі ў 722—705 да н.э. Прыйшоў да ўлады пасля звяржэння цара Салманасара V [727—722 да н.э.]. У сваёй палітыцы імкнуўся прыміріць інтарэсы жрэцтва і прывілеяваных гарадоў *Асірыі* і *Вавілоніі* з інтарэсамі ваен. партыі. Завяршыў заваяванне *Ізраільскага царства* (722) і Сірыі (717); у 714 перамог Русу I, цара *Урарту*, захапіў г. Мусасір з урарцкімі скарбамі, заваяваў шэраг абласцей ўсх. М. Азіі (імкнуўся не дапусціць саюзу Урарту з Фрыгіяй), а таксама Мідыі; у 710—709 авалодаў Вавілоніяй.

САРГА́САВА МО́РА (Sargasso Sea). У цэнтральнай частцы Атлантычнага акіяна. Абмывае ўсх. берагі Канады, ЗША, Кубы. Пл. 6—7 млн. км^2 (межы ўмоўныя і зменлівыя ў выніку сезонных перамяшчэнняў цячэнняў). Глыб. да 7110 м. Назва ад скопішчаў плаваючых саргасавых водарасцей, вял. колькасць якіх звязана з наяўнасцю ў С.м. зоны сыходжання паверхневых цячэнняў. У С.м. размешчаны Бермудскія а-вы. Уяўляе сабой застойны цэнтр асім. замкнутай антыцыкланічнай цыркуляцыі, тыповай для субтрапічных мораў, паміж цячэннямі Гальфстрым, Канарскім, Паўн.-Атлантычным і Паўн. Пасатным. Т-ра вады на паверхні 18—23 °С зімой, 26—28 °С летам. Салёнасць 36,5—37‰. Багаты жывёльны свет: свабоднаплаваючыя — макрэлевыя, лятучыя рыбы, марскія іголкі, крабы, марскія чарапахі і інш.; прымацаваныя да водарасцей — актыніі, імшанкі і інш.

САРДА́Р (сярдар, сірдар) (перс.), 1) у Асманскай імперыі тытул камандуючага палявой арміяй. 2) У Егіпце ў перыяд англ. панавання — брыт. афіцэр,



Сарган.

які камандаваў войскамі правіцеля краіны (хедыва). 3) У Іране, Афганістане — саноўнік, галава племені (у такіх выпадках часам С. — састаўная ч. імя). 4) У Індыі (да англ. заваявання ў 1840 Пенджаба — паўн. ч. Індыі) С. наз. сікхскія (каста *джатаў*) военачальнікі і прадстаўнікі мясц. феад. праслойкі (чл. кіруючай дынастыі, намеснікі абласцей і інш.).

САРДА́РАЎ Армен Сяргеевіч (н. 3.6.1948, г. Адэса, Украіна), бел. вучоны ў галіне архітэктуры, дызайну і гісторыі дарог. Канд. архітэктуры (1974). Скончыў БПІ (1970). З 1974 у дарожных установах, з 1990 у рэсп. унітарным прадпрыемстве «Белдарцэнтр» (з 1995 гал. архітэктар, з 2000 нам. ген. дырэктара — гал. архітэктар). У 1992—98 чл. к-та па ландшафтнай архітэктуры аўтамаб. дарог Транспартнага даследчага савета Нац. АН ЗША. Навук. працы па тэарэт.

А.С.**Сардараў**. Знак «Нулявы кіламетр» (Мінск, 1998).

асновах дарожнай архітэктуры. Стварыў арх.-дызайнерскую службу аўтамаб. дарог Беларусі. Аўтар арх. праекта знака «Нулявы кіламетр», устаноўленага на Кастрычніцкай плошчы Мінска (1998).

Тв.: История и архитектура дорог Белоруссии. Мн., 1978; Архитектура автомобильных дорог. М., 1986; Книга о дорогах: Дороги в человеческой цивилизации и культуре. Мн., 2000.

СА́РДЖЭНТ (Sargent) Джон Сінгер (12.1.1856, г. Фларэнцыя, Італія — 15.4.1925), жывапісец. Вучыўся ў АМ у Фларэнцыі (1870—73), у Э.А.Каралюс-Дзюрана ў Парыжы (1874—79). Зазнаў уплывы Г.Курбэ, Э.Манэ і К.Манэ. З 1885 жыў у Лондане, наведваў ЗША. Найб. вядомы як майстар віртуозных свецкіх партрэтаў: «Мадам Х» (1884), «Лорд Рыблсдэйл у паляўнічым касцюме» (1902) і інш. Шэрагу партрэтаў уласцівы вострая назіральнасць і цікавасць да псіхалогіі партрэтаваных [партрэты Р.Л.Стывенсана, 1884—87; мадам Поль Пуарсон (Сеймурыка Кютбер), 1885]. Пісаў эфектныя жанравыя карціны («Кітайскія ліхтарыкі», 1885—86), эцюды-сцэнкі парыжскага жыцця ў манеры, блізкай да імпрэсіяністаў («Халео», 1882; «Пол Хелью з жонкай на эцюдах», 1889). З 1890-х г. стварай імпрэсіяністычныя акварэльныя пейзажы. Аўтар манум. размалёвак у Публічнай б-цы ў Бостане (1890—1919). *І.М.Скварцова.*

САРДЗІ́НІЯ (Sardegna), востраў у Міжземным м. на З ад Апенінскага п-ва, у складзе Італіі. Аддзелены ад в-ва Корсіка прал. Баніфача. Уключае 4 правінцыі: Кальяры, Нуора, Сасары, Арыстана. Пл. 24 тыс. км². Нас. каля 2 млн. чал. (2000). Берагі расчлянёны слаба. У рэльефе пераважаюць плато з асобнымі выш. 1000—1200 м і плоскія ўступы, якія стромка абрываюцца да мора. Найб. выш. да 1834 м (г. Ла-Марамара). Горы складзены ў асн. з гранітаў і крышт. сланцаў, на З і ПнЗ — лававыя і туфавыя плато. З ПнЗ на ПдУ цягнецца тэктанічная ўпадзіна Кампідана. Карысныя выкапні: кам. вугаль, полімет. і жал. руды, баксіты, магнезіт, барыт, каалін. Клімат субтрапічны, міжземнаморскі. Сярэдняя т-ра студз. 7—10 °С, ліп. 24—26 °С. Ападкаў ад 600 мм на раўнінах да 1000 мм за год у горах. Значныя рэкі: Тырса, Флумендоса, Ману. Пераважаюць зараснікі — макві, фрыгана; у горах — коркавы дуб. Гал. горад і порт — Кальяры.

З 7 ст. да н.э. С. каланізавалі фінікійцы і грэкі. З 535 да н.э. востравам валодаў *Карфаген*, з 238 да н.э. — *Рым* Стараж., у 5 ст. н.э. — вандалы, у 6—7 ст. — візантыйцы і готы, з 8 ст. — арабы. У 11 ст. арабы выгнаны з С. аб'яднанымі сіламі Пізанскай і Генуэзскай рэспублік, якія потым працяглы час сапернічалі паміж сабой за ўплыў на востраве. З 1326 С. пад уладай каралеўства *Арагон*, з 1479 — аб'яднанага Іспанскага каралеўства.

Дж.С.**Сарджэнт**. Партрэт мадам Поль Пуарсон. 1885.

У 1708 у час вайны за *іспанскую спадчыну* С. перайшла да Аўстрыі, што замацаваў *Рашцкі мір 1714*, паводле Лонданскага дагавора 1720 — да Савойскай дынастыі і стала часткай *Сардзінскага каралеўства*. У 1793 жыхары С. сарвалі спробу франц. войск захапіць востраў. У 1799—1814, калі *П'емонт* (асн. ч. каралеўства) быў акупіраваны Францыяй, на востраве знаходзіліся сардзінскія каралі. З 1861 у складзе аб'яднанай Італіі.

САРДЗІ́НІЯ (Sardegna), адм. вобласць Італіі на в-ве Сардзінія і суседніх невял. астравах. Адміністрацыйна падзелена на правінцыі Кальяры, Нуора, Сасары, Арыстана. Пл. 24,1 тыс. км². Нас. каля 2 млн. чал. (2000). Гал. горад *Кальяры*. Асн. галіны эканомікі — сельская гаспадарка і горназдабыўная прам-сць. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 1,7 млн. га, у т.л. каля 74% займаюць пашы і лугі, каля 19% — ворыва, каля 6% — сады і вінаграднікі. Пасевы збожжавых, бабовых, бульбы, артышокаў; агародніцтва, вінаградарства, культура слівы, цытрусавых і інш. Пераважнае значэнне мае жывёлагадоўля (каля 1/3 пагалоўя авечак у Італіі, буйн. раг. жывёла, свінні). Рыбалоўства. Здабыча свінцу і цынку, кам. вугалю, флюарыту, баксітаў. Прам-сць: каляровая металургія, нафтаперапрацоўка і нафтахімія, харч., тэкст., гарбарная, дрэваапр., эл.-тэхн., суднарамонт. Ручное дыванаткацтва. Транспарт марскі, чыг. і аўтамабільны. Прыроду гл. ў арт. *Сардзінія* (востраў).

САРДЗІ́НСКАЕ КАРАЛЕ́ЎСТВА, дзяржава ў Італіі ў 1720—1861. Утварылася ў выніку далучэння в-ва *Сардзінія* да *Савойскага герцагства*, герцагі якога прынялі тытул сардзінскіх каралёў (гл. *Савойская дынастыя*). Сталіца — г. *Турын*, тэр. ядро — вобласць *П'емонт*, назва якой стала неафіц. назвай усяго каралеўства. З 1792 С.к. ўдзельнічала ў антыфранц. кааліцыі. У 1792 Францыя акупіравала і анексіравала прыналежныя С.к. вобласць Савоя і г. Ніца з наваколлем, у 1798 — П'емонт. Улада Савойскай дынастыі захавалася толькі на Сардзініі. Паводле рашэння *Венскага кангрэса 1814—15* С.к. адноўлена ў ранейшых межах і да яго далучана вобласць *Лігурыя* з г. *Генуя*. У 1821 аўстр. войскі задушылі ў П'емонце ўзначаленую *карбанарыямі* антыабсалютысцкую рэвалюцыю. У 1840-я г. ў выніку прамысл. перавароту С.к. ператварылася ў эканам. развітую дзяржаву, якая праводзіла незалежную знешнюю палітыку, была адным з цэнтраў барацьбы за вызваленне і аб'яднанне Італіі (*рысарджымента*). У *рэвалюцыю 1848—49 у Італіі* ў С.к. ў сак. 1848 абвешчана ліберальная канстытуцыя. Італьян. войскі пацярпелі паражэнне ў *аўстра-італьянскай вайне 1848—49*, у час якой спрабавалі вызваліць ад аўстр. панавання Ламбардыю і Венецыю. С.к. ўдзельнічала на баку антырас. кааліцыі ў *Крымскай вайне 1853—56*. У выніку *аўстра-італа-французскай вайны 1859* і *рэвалюцыі 1859—60 у Італіі* да С.к. далучана амаль уся тэр. Італіі, акрамя Рымскай і Венецыянскай абласцей. 17.3.1861 замест

С.к. абвешчана Італьян. каралеўства на чале з апошнім сардзінскім каралём *Віктарам Эмануілам II*.

САРДЗІ́НЫ, рыбы сям. селядцовых. 2 роды, у кожным па 1 відзе (з падвідамі): С. еўрапейская (Sardina pilchardus) і С. ціхаакіянская (Sardinops sagax, яе падвід — С. далёкаўсходняя, або *івасі*). Пашыраны ва ўмерана цёплых і субтрапічных водах абодвух паўшар'яў, акрамя ўсх. узбярэжжаў Паўн. і Паўд. Амерыкі.

Сардзіна еўрапейская.

Цела прадаўгаватае, сціснутае з бакоў; даўж. да 35 см (звычайна 15—20). Уздоўж спіны па баках шэраг цёмных плям, каля хваставога плаўніка — пара падоўжаных лускавінак («крыльцы»), на шчэлепнай накрыўцы — радыяльныя раўчукі. Планктафагі. Аб'ект промыслу.

САРДУРЫ́ I, цар Урарту ў 2-й пал. 9 ст. да н.э., сын Лутыпры. Сучаснік асірыйскага цара Салманасара III, у надпісах якога пра падзеі 833 да н.э. ўпамінаецца пад імем Седуры. Да нашага часу дайшлі таксама надпісы С. на асірыйскай мове на пабудаванай ім крапасной сцяне г. Тушпа (цяпер г. Ван, Турцыя). С. вёў войны з Асірыяй і, верагодна, значна ўмацаваў Урарцкае царства.

САРДЭ́ЧНІК (Leonurus), род кветкавых раслін сям. губакветных (яснотkавых). Каля 15 відаў. Пашыраны ва ўмераным поясе Еўразіі. На Беларусі 2 віды С.: пяцілопасцевы (L. quinquelobatus) і сардэчны (L. cardiaca). Трапляюцца на пустках, у зарасніках хмызняку, уздоўж дарог.

Сардэчнік сардэчны.

Шматгадовыя травы выш. 25—120 см. Сцёблы прамастойныя, 4-гранныя, апушаныя. Лісце 3—5-раздзельнае або лопасцевае. Кветкі ружовыя, у несапраўдных кальчаках, сабраныя ў падоўжанае коласападобнае суквецце. Плод — арэшак. С. пяцілопасцевы і сардэчны маюць у сабе сардэчныя гліказіды, сапаніны, эфірны алей, культывуюцца і выкарыстоўваюцца ў афіц. і нар. медыцыне. Меданосныя, фарбавальныя, лек., тэхн. (алей, валокны) расліны, некат. — пустазелле.

А.М.Скуратовіч.

САРДЭ́ЧНЫЯ ГЛІКАЗІ́ДЫ, арганічныя лекавыя сродкі, якія паляпшаюць работу сэрца. У прыродзе ёсць у раслінах 45 відаў (лілейных, казяльцовых, бабовых і інш.), таксама ў скурным ядзе некат. рапух. Найб. пашыраны прэпараты *наперстаўкі* (дыгітаксін, лантазід, цэланід), *ландыша* (настойка, карглікон), *светніку* (экстракт сухі, аданізід), страфанту (страфанцін) і інш.

Павялічваюць сілу і скорасць сардэчных скарачэнняў, запавольваюць рытм, памяншаюць вянозны ціск крыві і ацёкі. Ужываюць для лячэння хранічнай або вострай сардэчнай недастатковасці, асабліва эфектыўныя пры артэрыяльнай гіпертэнзіі, клапанных пароках сэрца, атэрасклератычным кардыясклерозе.

САРЖЭ́ЎСКІ Аляксандр Міхайлавіч (27.8.1930, г. Арзамас Ніжагародскай вобл., Расія — 21.3.1983), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1973), праф. (1974). Засл. дз. нав. Беларусі (1980). Скончыў БДУ (1953). З 1953 у Ін-це фізікі АН Беларусі. З 1967 у БДУ (заг. кафедры). Навук. працы па люмінесцэнцыі, квантавай электроніцы і нелінейнай спектраскапіі, праблемах выкладання фізікі ў ВНУ. Устанавіў асн. заканамернасці ўзаемадзеяння лазернага выпрамянення са складанымі арган. малекуламі.

Тв.: Анизотропия поглощения и испускания света молекулами. Мн., 1971 (разам з А.Н.Сеўчанкам); Наглядность в демонстрационном эксперименте по физике: (Эргон. подход). Мн., 1983 (разам з В.М.Навумчыкам); Оптика. Т. 1. Мн., 1984. *П.М.Бараноўскі.*

САРКАДО́Н ЧАРАПІ́ЦАВЫ, грыб, тое, што *лось*.

САРКА́ЗМ (грэч. sarkasmos ад sarkazō літар. — рву мяса), з'едлівая, злосная, знішчальная насмешка; найвышэйшая ступень *іроніі*. Адзін з асн. сродкаў *гумару* і асабліва *сатыры*. Характарызуецца найменшай ступенню іншасказальнасці; часам негатыўная ацэнка выяўляецца ў адкрытай форме. Пашыраны ў фальклоры (найперш у анекдотах), байках, эпіграмах, фельетонах, памфлетах, сатыр. камедыях і інш.

САРКАІДО́З [ад грэч. sarx (sarkos) мяса + eidēs падобны + ... *оз*(ы)], грануламатоз дабраякасны, захворванне чалавека, пры якім пашкоджваюцца многія органы і тканкі, у т.л. скура. Вылучаюць дробнавузельчыкавую, вузлавую і дыфузна-інфільтравальную формы С. скуры. Пашкоджваюцца таксама лімфатычныя вузлы, вочы, косці. Лячэнне комплекснае.

САРКАСПАРЫ́ДЫІ (Sarcocystis), мясныя спаравікі, род прасцейшых атр. *какцыдый*; унутрыклетачныя паразіты млекакормячых, птушак, зрэдку паўзуноў. Узбуджальнікі *саркацыстозаў* (саркаспарыдыёзаў). Каля 90 відаў.

Маюць складаны тып развіцця са зменай гаспадара. Бясполае размнажэнне (*шызаганія*) працякае ў арганізме (мышцах) прамежкавага гаспадара, які заражаецца, калі праглынае спарацысты (зародкі) С., што выдзяляюцца канчатковым гаспадаром з фекаліямі. Палавое размнажэнне (гомаганія і спораганія) працякае ў арганізме (кішэчніку) канчатковага гаспадара, які заражаецца пры ўжыванні мяса прамежкавага гаспадара з саркацыстамі (адна са стадый бясполага размнажэння). Спарацысты інвазійныя для прамежкавага гаспадара. Чалавек можа быць прамежкавым (для Sarcocystis lindemanni) і канчатковым гаспадаром С. (S. suihominis, S. bovihominis).

САРКАФА́Г (грэч. sarkophagos літар. пажыральнік мяса ад sarx мяса + phagos пажыральнік), труна, невял. грабніца ў народаў старажытнасці; у шырокім сэн-

Старажытнаегіпецкі **саркафаг** Тутанхамона.

Саркафаг з выявай 12 апосталаў. 5 ст. (г. Равена, Італія).

Саркафаг з г.п. Тураў Гомельскай вобл. 12 ст.

се — любая архітэктурна і па-мастацку аформленая труна з дрэва, каменю, металу і інш. Найб. вядомы С. стараж.-егіпецкія (складаліся з мноства частак, першапачаткова ў выглядзе жытла, з 3-га тыс. да н.э. — муміяпадобныя), этрускія (з фігурай памерлага на вечку), эліністычныя, стараж.-рым. і раннесярэдневяковыя (аздобленыя рэльефамі і арх. дэкорам). Тып ант. С. развіваўся і ў эпоху рэнесансу і барока. У Кіеўскай Русі С. паявіліся з прыняццем хрысціянства (напр., Яраслава Мудрага ў Кіеўскім Сафійскім саборы). Самы стараж. С. на Беларусі знойдзены ў г.п. Тураў Гомельскай вобл. (12 ст.). Вядомы С. кн. Радзівілаў (17 — пач. 20 ст., Нясвіжскі касцёл Божага Цела), Сапегаў (18 ст., Гальшанскі касцёл францысканцаў). *М.М.Чарняўскі.*

Саркафаг К.С.Радзівіла Пане Каханку ў крыпце Нясвіжскага касцёла Божага Цела. 18 ст.

САРКАЦЫСТО́ЗЫ, с а р к а с п а р ы д ы ё з ы, пратазойная інвазія чалавека і жывёл, якая выклікаецца прасцейшымі з роду саркацыстыс; характарызуецца пашкоджаннем мышачнай тканкі і ўнутр. органаў. У чалавека звычайна працякае бессімптомна, суправаджаецца кішэчнымі расстройствамі. Лячэнне тэрапеўтычнае. У арганізме буйн. раг. жывёлы, авечак, свіней паразіты развіваюцца пераважна ў мышачнай тканцы, утвараюць шматлікія цысты. Жывёлы заражаюцца ад сабак, катоў, дзікіх драпежнікаў і інш. Пры С. развіваецца анемія, атрафія мышачнай тканкі.

САРКІСЬЯ́Н Віктар Уладзіміравіч (н. 6.2.1947, г. Каменск-Шахцінскі Растоўскай вобл., Расія), бел. артыст балета, балетмайстар. Нар. арт. Беларусі (1975). Скончыў Бел. харэагр. вучылішча (1967), Мінскі ін-т культуры (1982). У 1967—87 саліст Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі, адначасова ў 1983—85 гал. балетмайстар Дзярж. т-ра муз. камедыі Беларусі; з 1967 выкладчык (з перапынкамі) Бел. харэагр. каледжа, у 1993—95 — Бел. ун-та культуры. Танец С. адметны пластычнай выразнасцю, моцнай экспрэсіяй, віртуознай тэхнікай, вял. скачком. Шырокі творчы дыяпазон дазваляў ствараць рознахарактарныя вобразы. Сярод лепшых роляў у балетах бел. кампазітараў: Іван, Філіп («Альпійская балада», «Тыль Уленшпігель» Я.Глебава), Юнак («Пасля балю» Г.Вагнера), у спектаклях класічнага і сучаснага рэпертуару: Базіль («Дон Кіхот» Л.Мінкуса), Блазан і Ротбарт («Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага), Крас («Спартак» А.Хачатурана), Нуралі («Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева), Д'ябал («Стварэнне свету» А.Пятрова), Тарэра («Кармэн-сюіта» Ж.Бізэ — Р.Шчадрына), Чыпаліна («Чыпаліна» К.Хачатурана), Блазан («Папялушка» С.Пракоф'ева). Паставіў танцы: да опер «Казкі Гофмана» Ж.Афенбаха і «Кавалер руж» Р.Штрауса ў Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі; балета «Паненка і хуліган» Дз.Шастаковіча, аперэт «Судны

В.**Саркісьян** ў ролі Івана.

час» Р.Суруса, «Фраскіта» Ф.Легара, «Дзяніс Давыдаў» А.Мдывані, мюзікла «Шклянка вады» У.Кандусевіча, спектакля-бенефіса — «Зоркі тэатра зззяюць для Вас» у Дзярж. т-ры муз. камедыі Беларусі; спектакляў «Паўлінка» паводле Я.Купалы, «Валенсіянскія вар'яты» паводле Лопэ дэ Вэгі, «Тэатр — маё каханне» паводле У.С.Моэма ў Нац. т-ры імя Я.Купалы і «Сказ пра Гаўрылу з-пад Полацка» ў Нац. т-ры імя Я.Коласа і інш. драм. т-рах Беларусі, а таксама ў кіно («Восеньскі падарунак фей», «Гульня ўяўлення») і інш. Лаўрэат 1-га Міжнар. конкурсу артыстаў балета (1969, Масква). *А.І.Калядзенка.*

САРКО́ДАВЫЯ (Sarcodina), падтып прасцейшых; 3 кл.: караняножкі, прамянёвікі і сонечнікі (па інш. класіфікацыях С. — падтып з 8 кл. або клас з 4 падкл.). Больш за 11 тыс. відаў. Жывуць у марскіх і прэсных водах, глебе, ёсць паразітычныя формы. Удзельнічаюць ва ўтварэнні асадкавых парод. Выкапнёвыя (фарамініферы) вядомы з кембрыйскага перыяду.

Памеры ад некалькіх да сотняў мікраметраў. Арганелы руху і захопу корму — часовыя цытаплазматычныя адросткі — псеўдаподыі. Маюць ядро, пульсуючую і стрававальныя вакуолі, некат. — унутраны і вонкавы мінер. шкілет. Кормяцца бактэрыямі, водарасцямі, прасцейшымі. Размнажэнне бясполае (дзяленне напалам, розныя формы пачкавання) і палавое (узнікаюць жгуцікавыя ці амёбападобныя гаметы).

САРКО́МА [ад грэч. sarx (sarkos) мяса + ... *ома*], злаякасная *пухліна* чалавека і жывёл, якая развіваецца са злучальнай тканкі. На разрэзе падобная да сырога рыбінага мяса (адсюль назва). Адрозніваюць ангіясаркому (развіваецца з крывяносных сасудаў), лімфасаркому (з лімфатычных вузлоў), астэасаркому (з касцявой тканкі), ліпасаркому (з тлушчавай тканкі), нейрагенную С. (з нерв. тканкі). Прыкметы С.: пухліна хутка расце і разбурае навакольныя тканкі, метастазуе па крывяносных сасудах.

Прыкметы С. мяккіх тканак — пухліна без акрэсленых межаў, зрэдку боль. Пры С. касцей парушаецца іх функцыя, з'яўляецца прыпухласць, боль, які не сціхае. Лячэнне хірург., прамянёвая тэрапія, проціпухлінныя сродкі. У жывёл часцей адзначаюцца ліпасаркома і фібрасаркома (пухліна з валакністай злучальнай тканкі).

САРКСЯ́Н Ара Міграновіч (7.4.1902, г. Стамбул, Турцыя — 14.6.1969), армянскі скульптар. Нар. маст. СССР 1963. Правадз. чл. АМ СССР (1958). Скончыў маст. школу ў Канстанцінопалі (1921) і АМ у Вене (1924). З 1945 выкладаў у Ерэванскім маст.-тэатр. ін-це (з 1947 праф.). Адзін з заснавальнікаў армянскага філіяла Асацыяцыі мастакоў рэв. Расіі. Творы вызначаюцца яркасцю псіхал. характарыстык, строгім лаканізмам форм: помнікі С. Спандарану (1927), Н.Сцепаняну (1950) і А.Туманяну (1957) у Ерэване, С.М.Кіраву ў Ванадзоры (1942), У.І.Леніну ў г. Камо (1959), партрэты хлопчыка (1922), А.Мелік-Пашаева (1934), А.Джывелегава (1942), Спандарана (1947), Т.Тараманяна (1950), С.Шаўмяна (1952) і інш. Аўтар рэльефа для помніка героям майскага паўстання ў г. Ленінакан (цяпер г. Гюмры, 1930—31).

САРМА́ТЫ (лац. Sarmatae), аб'яднанне качавых жывёлагадоўчых іранамоўных плямён (*аланы*, раксаланы, саўраматы, языгі і інш.). У 6—4 ст. да н.э. жылі ў стэпах і лесастэпах паміж рэкамі Табол (у Сібіры) і Волга. У 3 ст. да н.э. рассяліліся ў раёнах на Пн ад Каўказскіх гор і ў Паўн. Прычарнамор'і, дзе моцна пацяснілі *скіфаў*. У 2 ст. да н.э. разам са скіфамі ваявалі супраць *Пантыйскага*

царства, але ў 1 ст. да н.э. падтрымалі пантыйскага цара *Мітрыдата VI Еўпатара* ў яго барацьбе з Рымам. У 1 ст. н.э. сярод С. асабліва ўзмацніліся аланы. У 3 ст. ўлада С. у Паўн. Прычарнамор'і падарвана *готамі*, у 4 ст. яны разгромлены *гунамі*. С. прынялі ўдзел у *Вялікім перасяленні народаў* (4—7 ст. н.э.), асобныя групы аланаў дасягнулі Іспаніі і Паўн. Афрыкі. У наступныя стагоддзі С. асімілявaліся з інш. народамі, у т.л. з цюркамоўнымі і славянскімі. У складзе *асецінаў* С. (аланы) захавалі аснову сваёй мовы. С. дасягнулі высокага майстэрства ў рамёствах, асабліва ў маст. апрацоўцы металаў і ювелірнай справе, аб чым сведчаць шматлікія знаходкі ў курганах.

САРМ'ЁНТА (Sarmiento) Дамінга Фаўсціна (14.2.1811, г. Сан-Хуан, Аргенціна — 11.9.1888), аргенцінскі дзярж. і грамадскі дзеяч, пісьменнік і гісторык. Прытрымліваўся поглядаў унітарыяў (прыхільнікаў унітарнай дзяржавы), змагаўся ў 1820—30-я г. на іх баку супраць федэралістаў. Праціўнік дыктатуры Х.М.*Росаса*, у 1840 эмігрыраваў у Чылі, дзе набыў шырокую вядомасць сваёй грамадска-публіцыст. дзейнасцю. У 1852 удзельнік паўстання, якое скінула Росаса. Прэзідэнт Аргенціны ў 1868—74, ажыццявіў шэраг рэформ, якія спрыялі развіццю эканомікі, сельскай гаспадаркі, культуры; пры ім будаваліся чыгункі, школы, бальніцы, бібліятэкі, створана АН. Аўтар гісторыка-філас. прац. Выступаў супраць дыктатуры, лічыў, што роўнасці класаў і грамадскай гармоніі можна дасягнуць шляхам усеагульнай асветы; у апошнія гады жыцця зведаў уплыў сацыял-дарвінізму.

Тв.: Рус. пер. — Цивилизация и варварство. Жизнеописание Хуана Факундо Кироги, а также физический облик, обычаи и нравы Аргентинской Республики. М., 1988.

СА́РНА, млекакормячае атр. парнакапытных, гл. *Серна*.

СА́РНАТЭ, неалітычная тарфянікавая стаянка 3-га — 1-й пал. 2-га тыс. да н.э. ў Вентспілскім р-не Латвіі. Выяўлены рэшткі 25 жытлаў, у т.л. 5 лёгкіх чатырохвугольных пабудоў з двухсхільнымі дахамі, драўляныя вёслы, коп'і, бумерангі, лыжы, калатушкі для разбівання арэхаў, матыкі, каўшы з зааморфнымі ручкамі, рэшткі рыбалоўных сетак, гліняны посуд і інш. Даследавана свяцілішча з драўляным ідалам і майстэрня па вырабе рэчаў з бурштыну. Асн. заняткі насельніцтва — рыбалоўства, паляванне, збіральніцтва. У тарфяніку С. таксама знойдзены рэшткі стаянкі з ямкава-грабеньчатай керамікай (2-я пал. 3-га тыс. да н.э.).

САРНО́Ў, Сарноф (Sarnov, Sarnoff) Давід (Дэвід, 27.2.1891, в. Вузляны Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 12.12.1971), амерыканскі сувязіст і бізнесмен, адзін з заснавальнікаў радыё- і тэлевяшчання ў ЗША. Ганаровы д-р Калумбійскага, Нью-Йоркскага і інш. ун-таў. Брыгадны генерал (1944). З 1900 у ЗША. З 1906 у «Кампаніі бяздротавага тэлеграфа Марконі» (Нью-Йорк). З 1919 у Радыёвяшчальнай карпарацыі Амерыкі (з 1922 віцэ-прэзідэнт, з 1930 прэзідэнт, у 1947—70 старшыня савета дырэктараў). З пач. 1920-х г. дарадца 10 прэзідэнтаў ЗША. 14.4.1912 прыняў радыётэлеграму аб крушэнні лайнера «Тытанік», які тануў, і 3 сут падтрымліваў сувязь з выратавальнікамі. Выказаў ідэі муз. радыёвяшчання і выпуску радыёпрыёмнікаў (1915—16). Заснаваў Нац. радыёвяшчальную кампанію Эн-Бі-Сі (1926). Арганізаваў рэгулярнае тэлевяшчанне ў ЗША (з 1939). Пад яго кіраўніцтвам створана сістэма каляровага тэлебачання, сумяшчальная з чорна-белай (1949), зроблены запіс тэлеперадачы на магн. відэастужку (1956), зняты першы тэлевізійны маст. фільм (1964). Удзельнічаў у стварэнні сістэм касм. сувязі, камп'ютэрызацыі ЗША. Міжнар. ін-т інжынераў-электрыкаў заснаваў прэмію яго імя за дасягненні ў галіне электронікі (1959).

В.У.**Саркісьян**.

Д.**Сарноў**.

Тв.: Looking ahead: The papers of David Sarnoff. New York, 1968.

Літ.: Lyons E. David Sarnoff: A biography. New York, 1966; Dreher C. Sarnoff: An american success. New York, 1977; Bilby K.W. The General: David Sarnoff and the rise of the communications industry. New York, 1986. *М.М.Касцюковіч.*

САРО́, возера ў Бешанковіцкім р-не на мяжы з Сенненскім р-нам Віцебскай вобл., у бас. р. Чарнагосніца, за 18 км на У ад г.п. Бешанковічы. Пл. 5,31 км², даўж. 9,47 км, найб. шыр. 910 м, найб. глыб. 36,3 м, даўж. берагавой лініі 22,6 км. Пл. вадазбору 104 км². Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы выш. 20—25 м

Возера **Саро**.

(на З да 10 м), на Пн паніжаюцца да 2 м, пад хмызняком, у верхняй ч. разараныя. На Пд на выш. 1,5 і 7 м тэрасы. Берагі выш. 0,5—0,8 м пясчаныя, на Пн нізкія забалочаныя. 2 астравы агульнай пл. 0,04 га. Зона мелкаводдзя ўздоўж усх. берагоў вузкая, зах. — значна пашыраецца. Пяскі адзначаны да глыб. 7—11 м у паўд. і 4 м ў паўн. ч. катлавіны, апясчаненыя адклады — ад-

А.**Саркісян**. Рэльеф помніка героям майскага паўстання ў Ленінакане. 1930—31.

паведна 15—18 і 8 м. Глыбакаводная зона выслана гліністым ілам. Мінералізацыя вады да 270 мг/л, празрыстасць 3,9 м. Мезатрофнае з прыкметамі алігатрафіі. Шыр. прыбярэжнай паласы трыснягу і чароту 5—40 м. Да глыб. 3,5—5 м растуць рдесты, рагаліснік, эладэя, імхі. Упадаюць 3 ручаі, у т.л. з воз. Тросна, выцякае ручай у воз. Астровенскае.

САРО́КА (Pica pica), птушка сям. крумкачовых атр. вераб'інападобных. Пашырана ў Еўразіі, Паўн.-Зах. Афрыцы, зах. абласцях Паўн. Амерыкі. На Беларусі шматлікі, звычайна аселы від. Зімой вандруе невял. чародамі, часта трымаецца населеных пунктаў, асабліва сельскага тыпу. Селіцца ў драбналістых лясах, сярод балот і палёў, у поймах рэк, гаях, парках.

Сарока.

Даўж. цела да 48 см, маса да 260 г. Апярэнне мяккае, кантрастнае, чорна-белае з зеленавата-сіняватым бляскам. Хвост доўгі, ступеньчаты. Гняздо будуе ў густых галінах куста або дрэва. Кладка — 5 (6—8) яец. Усёедная. Корміцца насякомымі, яйцамі і птушанятамі дробных птушак, мышападобнымі грызунамі, харч. адкідамі і інш.

САРО́КА, частка старадаўняга рус. галаўнога ўбору замужніх жанчын; чахол з палатна, кумачу ці інш. тканіны, які надзяваўся паверх *кічкі*. Мела вышытую пярэднюю частку, бакавыя лопасці з завязкамі і заднюю частку. Паверх С. завязвалі хустку. Бытавала таксама ў некат. груп мардвы. З канца 19 ст. выйшла з ужытку.

САРО́КА, руская назва скарастрэльнай мнагаствольнай гарматы ў 16 — пач. 17 ст. Складалася з аднатыпных пісталетных, ружэйных або пішчальных ствалоў, змацаваных на адным лафеце. Запальныя адтуліны ствалоў кожнага рада злучаліся агульным жолабам з порахам для адначасовага загарання зарадаў. Страляла залпамі. У Зах. і Цэнтр. Еўропе С. наз. *арганам*.

САРО́КА Валерый Майсеевіч (н. 14.11.1938, Мінск), бел. скрыпач. Засл. арт. Беларусі (1985). Скончыў Бел. кансерваторыю (1961). З 1960 артыст, з 1965 канцэртмайстар Сімф. аркестра Бел. тэлебачання і радыё, адначасова ў 1962—63 у складзе Квартэта Саюза кампазітараў Беларусі (1-я скрыпка), з 1967 выкладчык (з 1975 таксама кіраўнік камернага аркестра) Рэсп. школы-інтэрната па музыцы і выяўл. мастацтве імя І.Ахрэмчыка. З 1991 артыст Дзярж. аркестра сімф. і эстр. музыкі Беларусі, з 1999 дырыжор камернага аркестра гэтага калектыву. Як першы выканаўца многіх твораў бел. кампазітараў садзейнічаў канцэртнай прапагандзе бел. музыкі і адраджэнню старадаўняй музыкі Беларусі. *Л.С.Мітаковіч.*

САРО́КА Мікалай Фёдаравіч (н. 2.1.1949, в. Асіннікі Камянецкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне тэрапіі і рэўматалогіі. Д-р мед. н. (1992), праф. (1995). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1972). З 1978 у Мінскім мед. ун-це (з 1994 заг. кафедры, адначасова ў 1987—91 дэкан, з 1991 прарэктар). Навук. працы па механізмах патагенезу, ранняй дыягностыцы, метадах лячэння і прафілактыцы сістэмных захворванняў злучальнай тканкі і суставаў, тэрапеўт. праблемах у галіне кардыялогіі, пульманалогіі і гастраэнтэралогіі.

Тв.: Остеопороз: Практич. руководство для врачей. Мн., 1997; Глюкокортикостероидные гормоны в клинике внутренних болезней. Мн., 2000; Ревматоидный артрит: Пробл. диагностики и лечения. Мн., 2000 (разам з В.Я.Ягурам).

Сарока. Яраслаўская губерня. Расія. 19 ст.



Сарока барабаннага тыпу.

САРО́КА Рыгор Васілевіч (27.11.1823, в. Пакроўская Цвярской вобл., Расія — 22.4.1864), расійскі жывапісец. У 1842—47 вучыўся ў А.*Венецыянава*. Пісаў пейзажы, жанравыя сцэны, інтэр'еры, партрэты. Творы вызначаюцца сузіральнасцю, наіўным успрыняццем ідэі жыццёвай гармоніі, тонкай узгодненасцю тонаў залаціста-карычневай гамы, замкнёнасцю і статычнасцю кампазіцыі, абагульненасцю трактоўкі форм у спалучэнні з дакладным адлюстраваннем дэталей навакольнага асяроддзя: «Рыбакі. Від на возера Молдзіна», «Від на плаціну ў маёнтку Спаскае», «Адлюстраванне ў люстэрку» (усе 1840-я г.), «Гумно», «Кабінет у Астраўках» (абодва 1844), партрэт Венецыянава і інш.

Літ.: Григорий Сорока: [Альбом]. М., 1970.

САРО́КА Рыгор Сямёнавіч (н. 28.11.1944, в. Турэц-Баяры Маладзечанскага р-на Мінскай вобл.), бел. дырыжор, педагог. Засл. работнік культуры Беларусі (1988). Скончыў Маладзечанскае муз. вучылішча (1969) і Бел. кансерваторыю (1974; кл. В.Пісарчык і кл. А.Майзлера). З 1974 выкладчык, з 1980 дырэктар Маладзечанскага муз. вучылішча імя М.Агінскага. У 1976 стварыў камерны аркестр нар. інструментаў (з 1982 нар.; кіраваў ім да 1995) і ў 1979 сімф. аркестр (з 1987 нар.) пры Маладзечанскім муз. вучылішчы. *Л.А.Шымановіч.*

САРО́КА Эдуард Максімавіч (н. 31.7.1940, г. Шклоў Магілёўскай вобл.), бел. філосаф. Д-р філас. н. (1992). Скончыў Таджыкскі ун-т (1962). З 1970 у Ін-це філасофіі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па сінергетыцы ў трансдысцыплінарным аспекце, філас. праблемах структурнай устойлівасці самаарганізавальных сістэм, сац. экалогіі, глабальнага эвалюцыянізму, сістэмнай якасці, інтэгральнага вымярэння рэчаіснасці, сімволікі піфагарэйскай спадчыны. Распрацаваў дыялектыка-сінергетычную канцэпцыю структурнай гарманізацыі сістэм у прыродзе і грамадстве.

Тв.: Концепция уровней, отношение, структура: (К методологии социол. исслед.). Мн., 1978; Производственный коллектив: Функционирование и управление. Мн., 1978 (у сааўт.); Структурная гармония систем. Мн., 1984; Управление развитием социально-экономических структур. Мн., 1985; Критерий гармонии самоорганизующихся социоприродных систем. Владивосток, 1989; В поисках скрытого порядка. Владивосток, 1995 (у сааўт.); Философия: Уч.-метод. пособие. Мн., 2001 (разам з П.В.Кікелем).

САРО́КІН Анатоль Мікалаевіч (н. 21.5.1940, Мінск), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1980). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1962). У 1965—97 у Ін-це гісторыі Нац.

АН Беларусі. У 1997—2000 нач. аддзела гуманітарных навук Дзярж. вышэйшага атэстацыйнага к-та Рэспублікі Беларусь. Навук. працы па праблемах агр. гісторыі Беларусі 20 ст., саўгасаў і калгасаў, сельскіх рабочых, кулацтва, калектывізацыі, сац. выбухаў, паліт. рэпрэсій, гістарыяграфіі. Адзін з аўтараў калектыўных прац «Гісторыя Беларускай ССР» (т. 3—4, 1973—75), «Развіццё эканомікі Беларусі ў 1928—1941 гг.» (1975), «Перамога калгаснага ладу ў Беларускай ССР» (1981), «Гісторыя рабочага класа Беларускай ССР» (т. 2, 1985).

Тв.: Совхозы Белорусской ССР (1917—1941 гг.). Мн., 1979; Эксперимент: Человек и земля. Мн., 1994; На ростанях айчыннай гісторыі: Бел. вёска: Ад Дэкрэта да Кодэкса аб Зямлі (1917—1990-я гг.). Мн., 1999.

САРО́КІН Валянцін Васілевіч (н. 25.7.1936, хутар Авашл, Башкортастан), рускі паэт. Скончыў Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1965). З 1965 у час. «Волга» (г. Саратаў), з 1967 у час. «Молодая гвардия», у 1971—81 гал. рэдактар выд-ва «Современник», з 1983 прарэктар Літ. ін-та імя М.Горкага, Вышэйшых літ. курсаў у Маскве. Першая кніга паэзіі — «Мара» (1960). У зб-ках вершаў і паэм «Я не ведаю спакою» (1962), «Размова з каханай» (1968), «Блакітныя перавалы» (1970), «За жураўліным голасам» (1972), «Барвовыя салаўі» (1976), «Хачу быць ветрам» (1982, Дзярж. прэмія Расіі 1986), «Нас двое» (1987), «Абяцанне» (1989) і інш. — лёс Расіі і славян, айч. гісторыя; тэмы народ і герой, народ і паэт, творца і час, творца і радзіма, лірыка кахання. У кн. артыкулаў-роздумаў, нарысаў-апавяданняў «Падзяка: Паэт пра паэтаў» (1986) С. праз творчыя лёсы блізкіх яму паэтаў паказвае і свой лёс. Аўтар цыкла вершаў «Славянскія матывы», прысвечанага Беларусі. Перакладае на рус. мову вершы Р.Барадуліна, В.Зуёнка, Г.Пашкова, А.Пысіна і інш. Сакратар Міжнар. згуртавання пісьменніцкіх саюзаў (з 2000). Міжнар. прэмія імя М.Шолахава 2000.

Тв.: Избранное: Стихотворения и поэмы. М., 1978; Посвящение: Избр. М., 1982; Лирика: Стихи и поэмы. М., 1986; Лицо. М., 1997; Ратный миг. М., 2000; Бессмертный маршал. М., 2000.

Літ.: Ханбеков Л.В. Выбираю бой: Штрихи к творч. портрету В.Сорокина. Челябинск, 1980; Яго ж. Присягаю Уралу: Три лит. портрета. Челябинск, 1989. *А.В.Спрынчан.*

САРО́КІН Ігар Дзмітрыевіч (н. 14.6.1931, в. Марына Тамбоўскага р-на, Расія), бел. спявак (драматычны барытон). Засл. арт. Расіі (1961). Нар. арт. Беларусі (1963). З 1952 працаваў у оперных т-рах Масквы, Чэлябінска, Адэсы, Новасібірска. У 1962—88 саліст Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Валодае голасам шырокага дыяпазону, характэрнага тэмбру. Яркі сцэнічны талент артыста дазваляе яму ствараць псіхалагічна дакладныя вобразы. Найб. ярка творчая індывідуальнасць С. раскрылася ў ролях драм. і трагедыйнага планаў. У нац. операх стварыў запамінальныя вобразы Апанаса («Алеся» Я.Цікоцкага), Сцяпана («Яснае світанне» А.Туранкова), Леўчука («Сцежкаю жыцця» Г.Вагнера), Кізгайлы («Сівая легенда» Дз.Смольскага). Сярод партый класічнага і сучаснага рэпертуару: Рыгалета, Аманасра, Яга, граф ды Луна, маркіз ды Поза, Жэрмон («Рыгалета», «Аіда», «Атэла», «Трубадур», «Дон Карлас», «Травіята» Дж.Вердзі), Зурга, Эскамільё («Шукальнікі жэмчугу», «Кармэн» Ж.Бізэ), граф Альмавіва («Вяселле Фігара» В.А.Моцарта), Скарпія («Тоска» Дж.Пучыні), Альфіо («Сельскі гонар» П.Масканьі), Фрыдрых фон Тэльрамунд («Лаэнгрын» Р.Вагнера), Томскі («Пікавая дама» П.Чайкоўскага), князь Ігар («Князь Ігар» А.Барадзіна), Гразной («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Дэман («Дэман» А.Рубінштэйна), Шаклавіты («Хаваншчына» М.Мусаргскага), Чалхія («Міндыя» А.Тактакішвілі), Лістрат («У буру» Ц.Хрэннікава), Напалеон («Вайна і мір» С.Пракоф'ева). У камерным рэпертуары рамансы рус. і замежных кампазітараў-класікаў, песні і рамансы бел. кампазітараў. *І.М.Шмелькіна.*

В.В.**Сарокін**.

І.Дз.**Сарокін**.

П.А.**Сарокін**.

САРО́КІН (Sorokin) Піцірым Аляксандравіч (21.1.1889, г.п. Жэшарт, Комі, Расія — 10.2.1968), руска-амерыканскі сацыёлаг. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1914). Лідэр правага крыла эсэраў. З 1917 гал. рэдактар газ. «Воля народа», сакратар А.Ф.Керанскага. З 1920 праф. Петраградскага ун-та. У 1922 эмігрыраваў у Прагу. З 1923 у ЗША. З 1924 праф. Мінесоцкага, у 1930—59 — Гарвардскага ун-таў. З 1964 старшыня Амер. сацыялагічнай асацыяцыі. Сацыялагічная канцэпцыя С. фарміравалася пад уплывам Я.В.Раберці, М.М.Кавалеўскага, Л.І.Петражыцкага, Э.Дзюркгейма і інш. Характарызаваў сістэму сваіх сацыялагічных поглядаў як «разнавіднасць эмпірычнага неапазітывізму ці крытычнага рэалізму». Сацыялогію як навуку прадстаўляў у выглядзе 4 раздзелаў: агульнае вучэнне пра грамадства; сац. механіка (вывучэнне заканамернасцей і механізмаў грамадскага жыцця); сац. генетыка (даследаванне паходжання і развіцця грамадства і грамадскіх ін-таў); сац. палітыка (канцэпцыі прагрэсу грамадства і прапановы пэўных сродкаў для паляпшэння грамадскага жыцця). У анталагічным аспекце разглядаў грамадства як «сац. душу», «свет каштоўнасцей». Гіст. працэс уяўляў як цыклічную флуктуацыю пэўных тыпаў культур. Сярод асн. тыпаў культур вылучаў пачуццёвы (характарызуецца перабольшваннем значэння пачуццёвага ўспрымання свету); ідэацыянальны (вызначаецца дамінантай рацыянальнага мыслення); ідэалістычны (звязаны з інтуітыўным пазнаннем рэчаіснасці). Крызісны стан зах. грамадства 20 ст., на думку С., абумоўлены набліжэннем да пачуццёвага тыпу культуры. Выхад з крызісу бачыў у адмове ад спажывецкай псіхалогіі і імкненні да ідэацыянальнага тыпу культуры. Адзін са стваральнікаў тэорыі *мабільнасці сацыяльнай* і *сацыяльнай стратыфікацыі*. Адзін з заснавальнікаў *канвергенцыі тэорыі*. Будучыню цывілізацыі звязваў з інтэгральным тыпам грамадскага ладу, які пераадолее негатыўныя і аб'яднае лепшыя бакі капіталізму і сацыялізму.

І.**Сарокін** у ролі Леўчука.

Тв.: Рус. пер. — Дальняя дорога: Автобиогр. М., 1992; Человек. Цивилизация. Общество. М., 1992; Система социологии. Т. 1—2. М., 1993; Общедоступный учебник социологии; Статьи разных лет. М., 1994; Главные тенденции нашего времени. М., 1997; Преступление и кара, подвиг и награда: Социол. этюд об основных формах обществ. поведения и морали. СПб., 1999.

Літ.: Канев С.Н. Путь Питирима Сорокина. Сыктывкар, 1990; Голосенко И.А.

Питирим Сорокин: Судьба и труды. Сыктывкар, 1991. *Т.І.Адула.*

САРО́КІН Уладзімір Мікалаевіч (н. 29.4.1938, г. Старая Руса Наўгародскай вобл., Расія), бел. фізік. Д-р тэхн. н. (1976). Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т (1962). З 1962 у Ін-це цеплафізікі Сіб. аддз. АН СССР. З 1979 у Ін-це ядз. энергетыкі АН Беларусі (з 1981 заг. лабараторыі, у 1988—92 дырэктар). З 1992 у Ін-це праблем энергетыкі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па цеплафізіцы, гідрадынаміцы віхравых ядз. рэактараў, радыяцыйнай хіміі. Адкрыў наяўнасць 2 устойлівых станаў дысперсных вярчальных сістэм у ядз. рэактарах ракетных рухавікоў, тарпед і інш. (1979). Распрацаваў спосаб і абсталяванне для драбнення цвёрдых рэчываў (алмаз, драўніна, збожжа і інш.).

Тв.: Критерий термомеханической устойчивости тепловыделяющих аппаратов (разам з В.П.Коласам) // Докл. АН БССР. 1981. Т. 25, № 8; Влияние радиации на синтез канцерогенов в организме человека (разам з Л.М.Жыгуновай) // Конверсия научных исследований в Беларуси... Мн., 1999. Ч. 1.

САРО́КІНА Ніна Іванаўна (н. 13.5.1942, г. Электрасталь Маскоўскай вобл.), руская артыстка балета. Нар. арт. Расіі (1975). Нар. арт. СССР (1987). Скончыла Маскоўскае харэаграфічнае вучылішча (1961, кл. С.Галоўкінай). У 1961—88 у трупе Вял. т-ра ў Маскве. З 1989 педагог-рэпетытар гастрольна-канцэртнай групы «Зоркі Вялікага балета». Яе талент і творчая індывідуальнасць найб. ярка раскрыліся ў балетах, вырашаных мовай сучаснай харэаграфіі. Першая выканаўца партый: Дзяўчына («Геолагі» М.Карэтнікава, 1964), Выбранніца («Вясна свяшчэнная» І.Стравінскага, 1965), Дзяўчына («Ікар» С.Сланімскага, 1971), Кіці («Ганна Карэніна» Р.Шчадрына, 1972), Каханая («Азоранасць» А.Пахмутавай, 1973), Радысачка («Чыпаліна» К.Хачатурана, 1977). Сярод партый класічнага і сучаснага рэпертуару: Маша, Аўрора, прынцэса Флярына («Шчаўкунок», «Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Жанна («Полымя Парыжа» Б.Асаф'ева), Фрыгія («Спартак» А.Хачатурана), Гаспадыня Меднай гары, Анастасія («Каменная кветка», «Іван Грозны» С.Пракоф'ева), Муза («Паганіні» С.Рахманінава), Асель («Асель» У.Уласава), Геро, Шура Азарава («Каханнем за каханне», «Гусарская балада» Ц.Хрэннікава) і інш. Знялася ў тэлебалеце «Гарэзлівыя частушкі» (1970), у тэлефільмах-канцэртах «Харэаграфічныя навелы» (1973), «Танцуюць Ніна Сарокіна і Міхаіл Лаўроўскі» (1982). Лаўрэат Міжнар. конкурсаў.

С.В.Гуткоўская.

Н.Сарокіна ў ролі Асель.

САРО́КІНА Тамара Цімафееўна (н. 1.1.1927, в. Улукаўе Гомельскага р-на), бел. вучоны ў галіне псіхіятрыі. Д-р мед. н. (1978), праф. (1979). Скончыла Мінскі мед. ін-т (1950). З 1957 у Мінскім мед. ун-це (у 1973—89 заг. кафедры). Навук. працы па клініка-генет. параметрах шызафрэніі, палігеннай спадчыннай схільнасці да яе, расстройстве псіхікі ў жанчын у перыяд цяжарнасці.

Тв.: Скрытая депрессия в практике врачей. Мн., 1981 (разам з У.Ф.Дзесятнікавым).

САРО́Т (Sarraute) Наталі (18.7.1900, г. Іванава, Расія — 19.10.1999), французская пісьменніца; прадстаўніца *«новага рамана»*. З 1908 жыла ў Францыі. Скончыла Парыжскі ун-т. Працавала адвакатам. Дэбютавала зб. мініяцюр «Трапізмы» (1938). У творах паказвала свет праз яго адлюстраванне ў падсвядомасці, у найтанчэйшых парываннях душы. У раманах «Партрэт невядомага» (1948), «Мартэро» (1953), «Планетарый» (1959), «Залатыя плады» (1963), «Паміж жыццём і смерцю» (1968), «Вы чуеце іх?» (1972), «Гавораць дурні» (1976), «Ты сябе не любіш» (1989) бессэнсоўнасць штодзённага жыцця, драматызм адзіноты, раз'яднанасць людзей і інш. калізіі сучаснага чалавека. Аўтар кн. аднаактовых п'ес «Тэатр» (1978), мемуараў «Дзяцінства» (1983), эсэ.

Літ.: Рус. пер. — Золотые плоды. М., 1969; Вы слышите их? М., 1983; Детство // Иностр. лит. 1986. № 12; Здесь; Откройте. СПб., 1999.

САРО́ЧЫНА, вёска ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., на скрыжаванні аўтадарог Полацк—Лепель і Ушачы—Ула. Цэнтр сельсавета і калект. унітарнага с.-г. прадпрыемства. За 10 км на У ад г.п. Ушачы, 140 км ад Віцебска, 35 км ад чыг. ст. Полацк. 245 ж., 97 двароў (2001). Лясніцтва, акц. т-ва «Арэхаўна». Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі геал. помнік прыроды *Сарочынскі валун*.

САРО́ЧЫНСКІ ВАЛУ́Н, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1988). За 1,5 км на Пн ад в. Сарочына Ушацкага р-на Віцебскай вобл., у адхоне шашы Лепель—Полацк. Валун парфірападобнага буйназярністага граніту даўж. 2,3 м, выш. 2,2 м, шыр. 1,5 м, у абводзе 6,8 м, аб'ём 4 м^3, маса каля 10 т. Прынесены ледавіком каля 20—18 тыс. г. назад са Скандынавіі. *В.Ф.Вінакураў.*

САРСУ́ЭЛА (ісп. zarzuela), іспанскі нац. муз.-драм. жанр, дзе харавыя і сольныя нумары перамяжоўваюцца з размоўнымі дыялогамі і танцамі, блізкі да *аперэты*. Назва ад каралеўскай вілы каля Мадрыда, дзе ў 17 ст. адбыліся першыя пастаноўкі С. Раннія С. вядомы толькі як літ. творы; першая з захаваных з музыкай — «Адным толькі поглядам рэўнасць забівае» Х.Ідальга (лібрэта П.Кальдэрона, 1660). У 18 ст. С. занепала, выцеснена італьян. операй. У 19 ст. з адкрыццём у Мадрыдзе некалькіх т-раў для пастановак С. пачалося адраджэнне жанру ў 2 кірунках: в я л і к а я С. (у двух і болей актах) і м а л а я С. (аднаактовая, з рысамі *вадэвіля*). Сярод аўтараў музыкі С. ў 17—18 ст. С.Дуран, Г.Брунеці, Л.Бакерыні; у 19 ст. Ф.Барб'еры, Ф.Чуэка, Т.Брэтон, Э.Гранадас; у 20 ст. А.Вівес, М.Тароба.

САРТАВО́Е РАЯНАВА́ННЕ, замацаванне найб. прадукцыйных і каштоўных сартоў за пэўным рэгіёнам з улікам яго глебава-кліматычных умоў. Раянаваныя сарты ўключаюцца ў Дзярж. рэестр (банк даных пра сарты і дрэвава-кустовыя пароды) па выніках *сартавыпрабавання*. Улічваюць ураджайнасць, біял. асаблівасці, зіма- і хваробаўстойлівасць, скараспеласць, прыдатнасць да механізаванай уборкі, харч., тэхнал., кармавыя і інш. якасці сорту ці гібрыда. У Дзярж. рэестр у 1998—2000 упершыню ўключана 86 сартоў (з іх 20 бел. селекцыі); усяго 879 сартоў (2001). *З.А.Казлоўская.*

САРТАКО́Ў Сяргей Венядзіктавіч (н. 26.3.1908, г. Омск, Расія), рускі пісьменнік. Герой Сац. Працы (1984). Друкуецца з 1934. Першы зб. апавяданняў — «Аляксей Худаногаў» (1945). Асваенне прыродных багацяў Сібіры, прац. подзвігі людзей у аповесці «Каменны фундамент» (1938—49), раманах «Ледзяны скарб» (1961—62), «Філасофскі камень» (кн. 1—2, 1966—71), трылогіі «Барбінскія аповесці» («Горны вецер», 1957; «Не аддавай каралеву», 1960; «Павольны гавот», 1967; Дзярж. прэмія СССР 1970) і інш. У рамане «Хрыбты Саянскія» (кн. 1—3, 1940—48, канчатковая рэд. 1954—55) працэс фарміравання рабочага класа Сібіры, яго ўдзел у рэвалюцыі 1905. Аўтар аўтабіягр. аповесці «Над чыстым лістом» (1978), аповесцей для дзяцей «Па Чунскіх парогах» (1946), «Плыт ідзе на Поўнач» (1949), раманаў «Свінцовы манумент» (1980), «Вечная песня — калыханка» (1983), зб-каў апавяд. «Садок пад вокнамі» (1959), «Першая сустрэча» (1967), п'ес і інш. Асобныя яго апавяданні на бел. мову пераклалі А.Жук, Л.Салавей, У.Шахавец.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—6. М., 1978—80; А ты гори, звезда: Роман. М., 1985.

Літ.: Дремов А. Сергей Сартаков. М., 1975.

САРТБА́ЕВА Кайыргуль (н. 20.6.1936, с. Кара-Булак Чуйскай вобл., Кіргізія), кіргізская спявачка (лірыка-драм. сапрана). Нар. арт. СССР (1980). Скончыла Маскоўскую кансерваторыю (1962). З 1962 салістка Кіргізскага т-ра оперы і балета. З 1986 рэктар (з 1987 праф.) Кіргізскага ін-та мастацтваў. Сярод партый: Ай-Чурэк, Каныкей, Тотуя («Месяцавая прыгажуня», «Манас», «Тактагул» У.Уласава, А.Малдыбаева і У.Ферэ), Джаміля («Джаміля» М.Раўхвергера), Гюльсара («За гадзіну да світання» Уласава і Ферэ), Таццяна («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Вольга («Русалка» А.Даргамыжскага), Дэздэмона («Атэла» Дж.Вердзі), Чыо-Чыо-сан («Чыо-Чыо-сан» Дж.Пучыні), Маргарыта («Мефістофель» А.Бойта), Мікаэла («Кармэн» Ж.Бізэ) і інш. У камерным рэпертуары значнае месца займаюць творы рус. і замежных кампазітараў. Дзярж. прэмія Кіргізіі 1989.

САРТР (Sartre) Жан Поль (21.6.1905, Парыж — 15.4.1980), французскі філосаф, пісьменнік і літаратуразнавец,

Ж.П.Сартр.

прадстаўнік *экзістэнцыялізму* і *фенаменалогіі*. Скончыў Вышэйшую нармальную школу (1929). З 1931 выкладаў у ліцэях Парыжа, Гаўра і Ліёна. У час 2-й сусв. вайны ўдзельнік руху Супраціўлення. З 1945 узначальваў час. «Les temps modernes» («Новыя часы»). У цэнтры філасофіі С. — феномен чалавека і анталогія яго свядомасці. Крытыкаваў псіхааналіз і эксперым. псіхалогію, якія ператвараюць чалавека ў «раба сваіх эмоцый» і здымаюць з яго адказнасць; распрацаваў экзістэнцыяльна-псіхааналітычны метад, які даследуе асобу ў працэсе «самавынаходніцтва». У гал. філас. працы «Быццё і нішто» (1943) прапанаваў анталагічную канцэпцыю свету, які ўяўляў як сукупнасць 3 форм быцця: «б ы ц ц я - ў - с а б е» (цэласны, самадастатковы і нязменны наяўны матэрыяльны свет), «б ы ц ц я - д л я - с я б е» (свет чалавечай свядомасці), «б ы ц ц я - д л я - і н ш а г а» (свет індывідуальнай свядомасці чалавека ва ўспрыняцці інш. асобы). Лічыў, што чалавек знаходзіцца ў адвечным антаганізме ў адносінах і да матэрыяльнага свету, і да «быцця-для-іншага», якое выяўляецца ў барацьбе за доказ уласнай свабоды. На думку С., чалавек «асуджаны» на свабоду; імкненне шляхам самападману («кепскай веры») ухіліцца ад свабоды і звязаных з ёй адзіноты і адказнасці за выбар ператварае чалавека са свядомай істоты ў адзінку матэрыяльнага свету. У «Крытыцы дыялектычнага розуму» (1960, незавершаная) вызначыў у якасці недахопаў марксізму жорсткі дэтэрмінізм і недаацэнку ролі асобы ў гіст. працэсе; распрацаваў сац. анталогію, заснаваную на сінтэзе экзістэнцыялізму, фенаменалогіі і марксізму. Празаічныя і драм. творы С. прасякнуты экзістэнцыяльнымі ідэямі адчужанасці ад знешняга свету і самаадчужанасці чалавека (раман «Млоснасць», 1938), немагчымасці пазбавіцца ад абсурднасці рэчаіснасці (зб. апавяд. «Мур», 1939), шляху да свабоды і цяжару адказнасці за выбар (п'еса «Мухі», 1943; незавершаная тэтралогія «Дарогі свабоды», 1945—49), асуджанасці на адзіноту (п'еса «Пры зачыненых дзвярах», 1945) і інш. Проза С. спалучае рысы традыц. рэалізму, «плыні свядомасці» і натуралізму, эсэістычнасці і дакументалізму. С. імкнуўся пашырыць межы біягр. жанру: распрацаваў канцэпцыю «рамана рэальнай асобы», у якім разглядаў чалавека як «тыповую універсальную адзінку сваёй эпохі», спалучаючы маст. метады з экзістэнцыялізмам, псіхааналізам і навук. аналізам сац. асяроддзя. Прынцыпы «рамана рэальнай асобы» развіваў у творах «Бадлер» (1947), «Святы Жанэ, камедыянт і пакутнік» (1952), аўтабіягр. аповесці «Словы» (1964) і канчаткова замацаваў у рамане «Ідыёт у сям'і» (т. 1—3, 1971—72). Асаблівае месца ў яго творчасці належыць драматургіі. У п'есах імкнуўся да прытчавасці і развіваў прынцыпы ўласнай канцэпцыі «тэатра сітуацый», у якім універсальныя першаасновы чалавечай экзістэнцыі выяўляюцца праз прызму канкрэтнай сітуацыі («Мёртвыя без пахавання», 1946; «Брудныя рукі», 1948; «Д'ябал і Гасподзь Бог», 1951; «Пустэльнікі Альтоны», 1960 і інш.). Гісторыю л-ры разглядаў у кантэксце агульнага культ.-гіст. працэсу, лічыў, што кожны літ. стыль быў «ангажыраваны» пэўным класам, які імкнуўся да панавання ў грамадстве. С. адстойваў сац.-пераўтваральную функцыю л-ры і канстатаваў крызіс зах.-еўрап. л-ры 20 ст. як вынік «дэкласаванасці пісьменнікаў» («Што такое літаратура?», 1947). На бел. мову прозу і драматургію С. перакладаў З.Колас. П'еса С. «Пры зачыненых дзвярах» пастаўлена ў Дзярж. маладзёжным тэатры Рэспублікі Беларусь (1994) і Мінскім абл. тэатры (1996). Нобелеўская прэмія 1964, ад якой С. адмовіўся.

Тв.: Бел. пер. — Мур: Апавяданні. Мн., 1991; Пры зачыненых дзвярах // Пры зачыненых дзвярах: Драм. творы. Мн., 1995; Рус. пер. — Герострат: [Сб.]. М., 1992; Проблемы метода. М., 1994; Ситуации: Антология лит.-эстет. мысли. М., 1997; Идиот в семье: Г.Флобер от 1821 до 1857. СПб., 1998; Грязными руками: Пьесы. Харьков; М.; Назрань, 1999; Дороги свободы. М.; Назрань; Харьков, 1999; Что такое литература?; Слова. Мн., 1999; Бытие и ничто: Опыт феноменол. онтологии. М., 2000; Тошнота: Роман; Стена: Рассказы. Харьков; М., 2000.

Літ.: Д о л г о в К.М. Эстетика Жана-Поля Сартра. М., 1990; А р о н Р. Мнимый марксизм: Пер. с фр. М., 1993; А н д р е е в Л.Г. Жан-Поль Сартр: Свободное сознание и XX в. М., 1994; М і л а ш Ч. Дастаеўскі й Сартр: Пер. з пол. // Arche. 2000. № 1.

Н.Г.Кісялёва.

САРХ (Sarh), горад на Пд Чада. Адм. ц. правінцыі Сярэдняе Шары. Засн. французамі ў канцы 19 ст., да 1973 наз. Форт-Аршамбо. Каля 100 тыс. ж. (2000). На аўтадарозе Нджамена—Бангі (Цэнтр.-Афр. Рэспубліка). Аэрапорт. Бавоўнаачышчальная і тэкст. прам-сць (тэкст. комплекс). Паблізу нац. парк Манда.

СА́РЦІ (Sarti) Джузепе (1.12.1729, г. Фаэнца, Італія — 28.7.1802), італьянскі кампазітар, педагог. У 1784—1801 працаваў у Расіі прыдворным капельмайстрам, узначальваў хатнюю капэлу Р.Пацёмкіна. Сярод твораў больш за 50 опер, у т.л. оперы-серыя «Пакінутая Дыдона» (1762), «Юлій Сабін» (1781), опера-буф «Двое сварацца — трэці радуецца» (1782), а таксама напісаныя і пастаўленыя ў Пецярбургу «Арміда і Рынальда» (1786), «Андрамеда» (1798) і інш.; творы для хору і арк., у т.л. «Цябе, Бога, услаўляем» (1789, з нагоды ўзяцця Ачакава), «Юпітэр, слава і смерць» (1790) і інш. Адзін з аўтараў музыкі да п'есы Кацярыны II «Пачатковае кіраванне Алега» (1790). Вынаходнік апарата для вымярэння вышыні гуку, т.зв. пецярб. камертона. Сярод вучняў: А.Ведаль, Л.Гурылёў, С.Давыдаў, Д.Кашын.

САРЦЫ́НЫ (ад лац. sarcina звязка, цюк), бактэрыі звычайна сферычнай формы, якія пасля дзялення ў трох плоскасцях не разыходзяцца, а ўтвараюць вял. колькасць клетак у выглядзе пакетаў кубічнай формы. Пашыраны ўсюды. Нерухомыя. Трапляюцца сярод бактэрый розных сістэм. груп. Вылучаюць таксама род бактэрый Sarcina — анаэробныя грамстаноўчыя бактэрыі, што зброджваюць вугляводы.

САРЫ́-ДЖАЗ, горны хрыбет у Цэнтр. Цянь-Шані, паміж р. Сары-Джаз на Пн і яе левым прытокам р. Энгільчэк на Пд, пераважна ў Кіргізіі. Даўж. каля 110 км. Выш. да 6261 м. Складзены з метамарфічных сланцаў, мармурызаваных вапнякоў, гранітаў. На паўн. схіле — ледавікі Сямёнава, Мушкетава, каля падэшвы паўд. схілу — Паўн. Энгільчэк.

САРЫКАМЫ́ШСКАЕ ВО́ЗЕРА, С а р ы к а м ы ш, саланаватае возера ў цэнтр. ч. *Сарыкамышскай катлавіны*, у Туркменістане і Узбекістане. Пл. 2850 км^2, аб'ём вады 23,5 км^3, глыб. да 40 м. Узнікла ў 1971 у выніку затаплення скіднымі водамі групы Сарыкамышскіх азёр. Рыбалоўства.

САРЫКАМЫ́ШСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1914—15, баявыя дзеянні паміж рас. і тур. войскамі ў раёне г. Сарыкамыш (Турцыя) 22.12.1914—18.1.1915 у час 1-й

суєв. вайны. Тур. 3-я армія (камандуючы ваен. міністр Энвер-паша; 87 батальёнаў пяхоты, 22 сотні кавалерыі і 226 гармат) планавала разграміць рас. войскі і захапіць г. Карс. Рас. Каўказская армія (галоўнакамандуючы І.І.Варанцоў-Дашкаў, фактычна камандаваў яго пам. ген. А.З.*Мышлаеўскі*; 72 батальёны пяхоты, 43 сотні кавалерыі і 172 гарматы) імкнуліся ўтрымаць занятыя пазіцыі. Тур. армія дзейнічала разрознена і мела толькі часовы поспех. Рас. войскі, адбіўшы 29.12.1914 усе атакі праціўніка, перайшлі ў контрнаступленне і 2.1.1915 занялі Бардус, узялі ў палон 9-ы тур. корпус разам з яго штабам і камандзірам. Да 17—19.1.1915 рэшткі тур. арміі былі адкінуты на зыходныя пазіцыі.

САРЫКАМЫ́ШСКАЯ КАТЛАВІ́НА, Сарыкамышская ўпадзіна, бяссцёкавая ўпадзіна ў межах Туранскай нізіны, у Туркменістане і Узбекістане, на мяжы пустыні Каракумы і плато Усцюрт. Даўж. 125 км, шыр. 90 км. Дно размешчана на 38 м ніжэй узр. мора. Уяўляе сабой плоскую авальную чашу, запоўненую асадкамі стараж. возера і ўкрытую саланчакамі і перавеянымі пяскамі. Перыядычна прымала воды р. Амудар'я па рэчышчы Дар'ялык. У цэнтр. ч. — *Сарыкамышскае возера.*

САРЫКАПА́, мелкаводнае салёнае возера ў Кустанайскай вобл. Казахстана. Размешчана ў цэнтр. ч. Тургайскай лагчыны. Пл. 336 км^2 (па інш. звестках 184 км^2). Складаецца з некалькіх плёсаў. Упадаюць рэкі Сарыазен і Тэке.

САРЫКО́ЛЬСКІ ХРЫБЕ́Т. На Усх. Паміры, уздоўж мяжы Таджыкістана і Кітая. Выш. да 6351 м (г. Лявірдыр). Водападзел бас. рэк Тарым, Амудар'я і воз. Каракуль. Даўж. каля 350 км. Складзены гал. ч. з крышт. сланцаў і гранітоідаў. У паўн. ч. значнае зледзяненне (агульная пл. каля 132 км^2). У ніжняй ч. схілаў — разрэджаная расліннасць высакагорнай пустыні.

СА́РЫСА (ад грэч. sarisa кап'ё), асноўная зброя воінаў-сарысафораў (цяжкай пяхоты і конніцы) у Стараж. Грэцыі, Стараж. Македоніі і інш. дзяржавах у 4—2 ст. да н.э. Першапачаткова С. (даўж. 3 м) выкарыстоўвалася як кідальная і колючая халодная зброя, пазней (даўж. 6—7 м) стала толькі колючай зброяй. Воіны першых 6 шарэнгаў *фалангі* бралі С. ў руку так, каб яны выдаваліся наперад, утвараючы засцерагальны «дах».

СА́РЫЧАЎ Гаўрыла Андрэевіч (1763, С.-Пецярбург — 11.8.1831), расійскі мараплавец, гідраграф і географ. Адмірал (1829). Ганаровы чл. Пецярбургскай АН (1809). У 1785—94 удзельнічаў у экспедыцыі І.І.Білінгса ў паўн.-ўсх. ч. Сібіры і паўн. ч. Ціхага ак. Даследаваў і нанёс на карту ўзбярэжжа Ахоцкага м. ад пас. Ахоцк да вусця р. Алдома, нек. з Алеуцкіх а-воў (Прыбылова, Дыяміда, Св. Лаўрэнція, Св. Мацвея, асабліва Уналашка), усх. бераг Берынгава праліва. У 1802—06 узначальваў Балт. гідраграфічную экспедыцыю, з 1808 кіраваў гідраграфічнымі даследаваннямі ў Расіі. Склаў марскі атлас Балт. м. з Фінскім зал. і пралівам Катэгат (1812). Яго імем названы мыс на Алеуцкіх а-вах, в-аў у Чукоцкім м., праліў у Ціхім ак., вулкан і пасёлак на Курыльскіх а-вах і інш. геагр. аб'екты.

Літ.: Алексеев А.И. Г.А.Сарычев. М., 1966.

СА́РЫЧАЎ Юрый Аляксеевіч (28.4.1953, Мінск — 20.9.1997), бел. акцёр і рэжысёр т-ра лялек. Засл. арт. Беларусі (1990). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1975). У 1975—86, 1989—92 і 1996—97 акцёр, у 1987—89 рэжысёр Бел. дзярж. т-ра лялек, у 1992—93 рэжысёр-пастаноўшчык Брэсцкага абл. т-ра лялек, у 1994—96 гал. рэжысёр Мінскага абл. т-ра лялек «Батлейка» (г. Маладзечна). Для акцёрскага мастацтва С. характэрны псіхал. дакладнасць і яркая характарнасць. Найб. поўна талент праявіўся ў спектаклях для дарослых. Сярод роляў: Гефест («Хачу быць богам» А.Вярцінскага), Мядзведзь, Ілья Мурамец («Да трэціх пеўняў» В.Шукшына), Калібан («Бура» У.Шэкспіра), Паэт («Зорка і смерць Хаакіна Мур'еты» П.Неруды), Анёл А («Боская камедыя» І.Штока) і інш. Паставіў спектаклі: «Церам-Цераморк» С.Маршака (1985), «Казка пра Хлапчыша-Кібальчыша» А.Гайдара (1987), «Пра Фядота-Стральца, удалога малайца» Л.Філатава (1988), «Васіліса Прыгожая» С.Пракоф'евай і Г.Сапгіра (1990) у дзярж. т-ры лялек; «Доктар-Айбаліт» В.Карастылёва (1992), «Янка-ўдалец і нячыстая сіла» І.Сідарука (1993) і інш. ў Брэсцкім т-ры лялек; «Меч анёла» Сідарука (1994), «Незвычайныя спаборніцтвы» Я.Спяранскага (1995), «Снежная каралева» Х.К.Андэрсена (1995), «Доктар-Айбаліт» Карастылёва (1996) у т-ры лялек «Батлейка». *С.Ф.Юркевіч.*

САРЫЧЫ́, род птушак сям. ястрабіных, гл. *Канюкі*.

САРЭ́ДЫІ (ад грэч. sōros куча), органы вегетатыўнага размнажэння некат. лішайнікаў, вегетатыўныя ўтварэнні ў выглядзе зярністай або парашкападобнай масы на іх паверхні. Маюць адну ці некалькі клетак водарасці, абкружаных гіфамі грыба. Лёгка разносяцца ветрам, у спрыяльных умовах разрастаюцца ў новыя *слаявіны* (таломы). Характэрны для высокаарганізаваных форм ліставатых і кусцістых лішайнікаў (напр., некат. віды з сям. кладоніевых, пармеліевых). *У.У.Галубкоў.*

САРЭКА́Т ІСЛА́М (Sarekat Islam — Саюз ісламу), першая масавая паліт. арг-цыя ў Інданезіі. Створана ў 1912 як арг-цыя гандляроў, пазней стала масавай антыкалан. арг-цыяй. У 1919 аб'ядноўвала каля 2,5 млн. членаў. У 1921 з С.І. выключаны члены яго левага крыла, якія ў 1924 стварылі Камуніст. партыю Інданезіі. З 1929 наз. Парцей сарэкат ислам (Партыя саюза ісламу). У гады незалежнасці (з 1945) паступова страчвала паліт. ўплыў, у 1973 аб'ядналася з 3 інш. мусульм. партыямі ў Партыю адзінства і развіцця.

САРЭ́НТА (Sorrento), горад на Пд Італіі, на ўзбярэжжы Неапалітанскага зал. Тырэнскага м. Каля 20 тыс. ж. (2000). Марскі порт, чыг. ст., вузел аўтадарог. Прам-сць тэкст. і вінаробчая. Рыбалоўства. Саматужныя промыслы. Музей. Арх. помнікі 11—17 ст. Прыморскі кліматычны курорт. Турызм.

СА́Р'Я, вёска ў Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл., каля р. Сар'янка, на аўтадарозе Асвея—Верхнядзвінск. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 18 км на ПнЗ ад горада і 14 км ад чыг. ст. Верхнядзвінск, 193 км ад Віцебска. 528 ж., 243 двары (2001). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Магілы ахвяр фашызму. Помнік ахвярам фашызму. Помнікі архітэктуры: *Сар'янскі касцёл*, які ператвораны ў Свята-Успенскую царкву, і парк (19 ст.). У вёсцы ў Вял. Айч. вайну дзейнічала *Сар'янскае патрыятычнае падполле.*

САР'Я́Н (Сарян) Егам Багдасаравіч (25.12.1902, г. Тэбрыз, Іран — 14.11.1976), армянскі паэт. Засл. дз. культ. Арменіі (1967). Засл. дз. культ. Украіны (1972). Скончыў Тэбрызскую арм. семінарыю (1920). Настаўнічаў. З 1922 жыў у Арменіі. Друкаваўся з 1919. Аўтар зб-каў грамадз. і патрыят. лірыкі «Краіна Савецкая» (1930), «Поўдзень» (1935), «Балады» (1944), «Хрызантэма» (1968, Дзярж. прэмія Арменіі 1970), «Выбранае. Вершы і балады» (1974) і інш. Пераклаў на арм. мову вершы Я.Купалы «Хвалююцца морскія хвалі...», «Алеся», «Хлопчык і лётчык». На бел. мову яго асобныя вершы пераклаў М.Чарняўскі.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1982.

Літ.: Мнацаканян В. Егам Сарьян. Ереван, 1956.

САР'Я́Н Мартырос Сяргеевіч (28.2.1880, г. Растоў-на-Доне, Расія — 5.5.1972), армянскі жывапісец, адзін з заснавальнікаў нац. школы жывапісу. Нар. маст. СССР (1960). Правадз. чл. АМ СССР (1947). Правадз. чл. АН Арменіі (1956). Герой Сац. Працы (1965). Вучыўся ў Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства (1897—1904), у майстэрнях В.Сярова і К.Каровіна (1902—04). Зазнаў уплывы творчасці П.Гагена і А.Матыса. Чл. маст. аб'яднанняў «Блакітная ружа», «Саюз рускіх мастакоў», «Свет мастацтва», «Чатыры мастацтвы». Творчасць адметная дэкаратыўнасцю, плоскаснасцю кампазіцыі, пабудаванай на вял. колеравых плямах, дзе святлопаветраныя эфекты і перспектыва замяняюцца супастаўленнем і кантрастам колераў. У ранніх работах казачнасць усх. матываў спалучаў з музычнасцю кампазіцыйных рытмаў і

падкрэсленай дэкаратыўнасцю калары-ту («Каля гранатавага дрэва», 1907). У творах 1910—13, выкананых пад час вандровак у Турцыю, Егіпет і Іран, імкнуўся да зліцця дэкар. і канструктыўна-прадметнага пачаткаў («Фінікавая пальма»). З 1921 у Арменіі. З 1930-я г. шмат працаваў як партрэтыст, спалучаючы вострую характарнасць з увагай да душэўнага стану мадэлі (партрэты Р.Сіманава, 1939; А.Ісаакяна, 1940). У 1940—50-я г. пераважаў пейзажны жанр, эпічна-абагульненыя віды Арменіі: «Араратская даліна» (1945), «Арменія» (1957), цыкл «Мая Радзіма» (1952—58). Працаваў таксама як кніжны графік («Армянскія народныя казкі», 1933, і інш.) і тэатр. дэкаратар (сцэнаграфія і касцюмы да оперы «Алмаст» А.Спендыярава ў Т-ры оперы і балета імя Спендыярава ў Ерэване, 1938—39, і інш.). Дзярж. прэмія СССР 1941. Ленінская прэмія 1961. *І.М.Скварцова.*

М.**Сар'ян**. Фінікавая пальма. Егіпет. 1911.

САР'Я́НКА, рака ў Латвіі і Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл., правы прыток р. Зах. Дзвіна. Даўж. 87 км, пл. вадазбору 1000 км^2 (у межах Беларусі адпаведна 38 км і 800 км^2). Выцякае з воз. Броджайс у Латвіі, вусце за 1 км на ПдУ ад в. Вусце. Цячэ ў межах Латгальскага ўзв. і паўн.-зах. часткі Полацкай нізіны. Асн. прытокі: Сарыя, Чаўшыца, Асуніца (справа), Мальніца, Тур'я (злева). Даліна трапецападобная, шыр. 200—350 м. Схілы ўмерана стромкія, выш. 10—15 м, парэзаныя ярамі. Пойма перарывістая, месцамі чаргуецца па берагах, шыр. 150—200 м, у разводдзе затапляецца на глыб. да 1 м, у высокае разводдзе — да 1,5—2,5 м. Рэчышча звілістае і малазвілістае, неразгалінаванае, шыр. 5—10 м у верхнім і сярэднім цячэнні, 15—25 м — у ніжнім. Берагі стромкія і абрывістыя. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 7,4 м^3/с. Рака — водапрыёмнік меліярац. сістэм. *А.А.Макарэвіч.*

САР'Я́НСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў жн. 1941 — чэрв. 1942 у в. Сар'я Дрысенскага (цяпер Верхнядзвінскага) р-на Віцебскай вобл. Налічвала спачатку 6 чал. (кіраўнік Б.А.Жук), потым далучыліся патрыёты навакольных вёсак Громаўкі (А.А.Воранаў), Дзегцярова (В.І.Аўсюк), Мушына (А.Ф.Ліпскі), Шунькі (П.К.Пілюшкін), якія рыхтавалі людзей да партыз. барацьбы. Падпольшчыкі распаўсюджвалі сярод насельніцтва лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро, зрывалі збор акупантамі прадуктаў харчавання, вывяз насельніцтва на работу ў Германію, збіралі зброю, боепрыпасы, рабілі напады на дробныя ням. гарнізоны, арганізоўвалі засады. У сувязі з пагрозай выкрыцця падпольшчыкі (каля 30 чал.) пайшлі ў лес, дзе стварылі партыз. атрад імя Пархоменкі. У барацьбе з акупантамі загінула 11 падпольшчыкаў. *Б.П.Шымук.*

САР'Я́НСКІ КАСЦЁЛ, Сар'еўскі касцёл, помнік архітэктуры несапраўднай готыкі ў в. Сар'я Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. Пабудаваны ў 1852—57 (арх. Г.Шахта) І.Лапацінскім як родавая пахавальня. З 1865 належаў праваслаўным, у 1989 перададзены каталікам. Цагляны, 1-нефавы, прамавугольны ў плане, з 5-граннай апсідай і 2 невял. сакрыстыямі. Кампазіцыя гал. фасада ступеньчатая, 3-часткавая. Цэнтр. частку вылучаюць партал, завершаны вімпергам з разеткай у цэнтры, і 5-граннаыя контрфорсы з пінаклямі. Аналагічныя пінаклі і на вуглавых контрфорсах. Пластыку бакавых фасадаў узбагачаюць 2-часткавыя лапаткі, аркатурныя паясы і скразная востразубчатая аркада. Стральчатыя аконныя праёмы аздоблены архівольтамі. *У.В.Алісейчык.*

Сар'янскі касцёл.

«САС», прыватнаўласніцкі герб, якім карысталіся каля 300 родаў Беларусі, Украіны, Літвы і Польшчы, у т.л. Даніловічы, Скольскія, Сялецкія, Урускія, Шапціцкія. Асн. варыянт герба мае ў блакітным полі залаты маладзік рагамі ўгору, над ім паміж дзвюма 6-канцовымі залатымі зоркамі сярэбраная страла ўгору. Клейнод — над прылбіцай з каронай паўлінавыя пёры, прабітыя стралой. Існуюць варыянты герба з 3 зоркамі над маладзіком, з чырв. полем і стралой уніз і інш. Вядомы з сярэдзіны 15 ст.

САСАНІ́ДАЎ ДЗЯРЖА́ВА, дзяржава на Блізкім і Сярэднім Усходзе ў 3—7 ст. на чале з іранскай дынастыяй *Сасанідаў*. Засн. Ардашырам I, які ў 224 знішчыў *Парфянскае царства*; у 226/227 каранаваўся царом у г. Ктэсіфон, які зрабіў сталіцай дзяржавы. Яго сын Шапур I [239—272] далучыў да С.дз. вял. вобласці на З і У ад Ірана, вёў паспяховыя войны супраць Рым. імперыі. Дзярж. рэлігіяй С.дз. стаў *зараастрызм*, жрацы якога (магі) аказвалі вял. ўплыў на дзярж. справы, асабліва з часоў Шапура II [309—379]. У канцы 5 ст. С.дз. вяла барацьбу з *эфталітамі*, у бітве з якімі загінуў цар Пероз [459—484]. Востры сац. крызіс часоў кіравання Кавада I [488—496 і 499—531] выклікаў *маздакіцкі рух*. Пры Хасрове I Анушырване [531—579] унутр. становішча стабілізавалася, краіна падзелена на 4 вобласці: Харасан, Азербайган, Німруз і Харабаран (*Месапатамія*); усталяваўся падзел грамадства на саслоўі, прывілеяваныае становішча сярод якіх займалі магі і воіны (азаты). Пры Хасрове II Парвізе [591—628] С.дз. вяла вайну з Візант. імперыяй (602—628), захапіла Сірыю, Палесціну, Егіпет, б.ч. М. Азіі, але потым сасанідскія войскі пацярпелі паражэнне, і ўсе заваяванні былі страчаны. Вайна знясіліла С.дз. напярэдадні *арабскіх завяванняў*. Арабы разбілі войскі С.дз. ў бітвах пры Кадысіі (637) і Нехавендзе (642). Са смерцю цара Ездэгерда III [632—651/652] С.дз. спыніла існаванне, а яе землі ўвайшлі ў склад Арабскага халіфата (гл. *Халіфат*).

САСАНІ́ДЫ, дынастыя цароў (шахіншахаў) Ірана ў 3—7 ст. Заснавальнік — Сасан (верагодна, бацька Папака — першага цара Парса з роду С.). Напачатку былі правіцелямі вобл. Парс у Паўд.-зах. Іране пад вярх. уладай правіцеляў *Парфянскага царства*. У 224 сын Папака Ардашыр I [224—239] скінуў уладу парфян, заваяваў іх царства і абвясціў сябе царом. Найб. вядомыя з С.: Шапур I [239—272], Шапур II [309—379], Пероз [459—484], Кавад I [488—496, 498—531], Хасроў I Анушырван [531—579] і Хасроў II Парвіз [591—628]. Апошнім з С. быў Ездэгерд III [632—651 альбо 652], які пацярпеў паражэнне ў войнах з арабамі (гл. *Арабскія заваяванні*) і з гібеллю якога скончылася дынастыя.

СА́СВА, рака ў Зэльвенскім р-не Гродзенскай вобл., левы прыток р. *Зальвянка* (бас. р. Нёман). Даўж. 24 км. Пл. вадазбору 135 км². Пачынаецца за 1 км на Пн ад в. Рудзевічы, цячэ па паўд.-ўсх. частцы Ваўкавыскага ўзв., упадае ў р. Зальвянка за 2 км на З ад в. Хамічы. Рэчышча на ўсім працягу каналізаванае.

САСЕ́БА, горад у Японіі, на ПнЗ в-ва Кюсю. Каля 300 тыс. ж. (2000). Порт у бухце Сасеба, вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: суднабуд., станкаінструментальная, шкляная і керамічная, рыбаперапрацоўчая. Паблізу штучнае вырошчванне жэмчугу (у бухтах і залівах), здабыча каменнага вугалю.

САСІНО́ВІЧ Валерый Аркадзевіч (н. 5.5.1941, в. Затон Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне гідрадынамікі. Д-р тэхн. н. (1992). Скончыў БДУ (1968). З 1968 у Акадэмічным навук. комплексе «Ін-т цепла- і масаабмену» Нац. АН Беларусі (з 1999 заг. лабараторыі). Навук. працы па статыстычнай тэорыі турбулентнасці, турбулентным змешванні рэагуючых вадкасцей і газаў, мадэляванні турбулентных рэагуючых патокаў з дапамогай функцый размеркавання імавернасцей.

Тв.: Замкнутое уравнение для совместной плотности распределения вероятностей величин флуктуаций турбулентного скалярного реагирующего поля и его градиента (разам з В.А.Бабенкам, Ю.У.Жукавай) // Инженерно-физ. журн. 1998. Т. 71, № 5; Вывод и численное решение замкнутого уравнения для удельной площади изоскалярной поверхности в турбулентном реагирующем потоке (з імі ж) // Там жа. 1999. Т. 73, № 3.

САСКАТУ́Н (Saskatoon), горад на З Канады, на р. Саўт-Саскачэван, у прав. Саскачэван. Засн. ў 1883. Каля 200 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Гандлёва-размеркавальны цэнтр с.-г. раёна (збожжавыя, мясная жывёлагадоўля). Прам-сць: харч., швейная, хім., нафтаперапр., маш.-буд., цэментная. У С. і навакольлі — буйныя прадпрыемствы па здабычы і перапрацоўцы калійных солей. Ун-т.

САСКА́ЧЭВАН (Saskatchewan), рака на Пд Канады. Утвараецца ад сутокаў рэк Норт-С. і Саўт-С., якія пачынаюцца ў Скалістых гарах. Даўж. 544 км (ад вытоку р. Саўт-С. — 1928 км), пл. бас. 385 тыс. км². Цячэ па Вялікіх і Цэнтр. раўнінах, упадае ў воз. Вініпег. Разводдзе ў чэрв.—жн., межань ад снеж. да сакавіка. Ледастаў ад ліст. да красавіка. Сярэдні расход вады 780 м³/с. Выкарыстоўваецца для арашэння ў вярхоўях. Вадасх. Гранд-Рапідс у ніжнім цячэнні. Суднаходная на асобных участках. На р. Саўт-С. — г. Саскатун, на р. Норт-С. — гарады Эдмантан і Прынс-Альберт.

САСКА́ЧЭВАН (Saskatchewan), правінцыя на Пд цэнтр. ч. Канады. Пл. 651,9 тыс. км². Нас. 990,2 тыс. чал. (1996). Адм. ц. — г. Рэджайна. Правінцыя знаходзіцца ў межах *Лаўрэнційскага ўзвышша* на Пн і *Вялікіх раўнін* на Пд. На Пн і ПнУ хвойныя лясы, на Пд і ПдЗ лесастэп і стэп (прэрыя). У С. каля 30% с.-г. зямель краіны, правінцыя дае амаль 50% збору пшаніцы, больш за 60% жыта і аўса. Значныя зборы ячменю, лёну і рапсу. Развіта жывёлагадоўля (буйн. раг. жывёла і свінні). Птушкагадоўля. С.-г. вытв-сць сканцэнтравана на буйных высокамеханізаваных фермах. Буйная здабыча калійных солей, нафты, гелію, медзі, урану. Гал. галіны апрацоўчай прам-сці: харч. (мукамольная, мясакансервавая, масларобчая), хім., чорная металургія, с.-г. машынабудаванне, нафтаперапрацоўка, дрэваапр. і цэлюлозна-папяровая. Транспарт чыг. і аўтамабільны.

СА́СКАЯ ЛІ́ПКА, вёска ў Карцэвіцкім с/с Нясвіжскага р-на Мінскай вобл., каля р. Уша. Цэнтр калект. с.-г. прадпрыемства. За 7 км на ПдЗ ад г. Нясвіж, 119 км ад Мінска, 15 км ад чыг. ст. Гарадзея. 666 ж., 254 двары (2001). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

САСКУЭХА́НА (Susquehanna), рака на У ЗША. Даўж. 990 км, пл. бас. 71 тыс. км². Вытокі ў Апалачах, перасякае плато Підмант, дзе ўтварае парогі і вадаспады, упадае ў Чэсапікскі зал. Атл. ак. Веснавое разводдзе, межань у вер.—ліставадзе. Ледастаў ад канца снеж. да канца сак. — пач. красавіка. Сярэдні расход вады 1140 м³/с. ГЭС. Суднаходная ў ніжнім цячэнні.

САСЛО́ЎНАЯ МАНА́РХІЯ, саслоўна-прадстаўнічая манархія, форма дзяржавы, пры якой улада *манарха* спалучалася з органамі саслоўнага прадстаўніцтва дваранства, духавенства і гараджан. Склалася ў большасці краін Еўропы ў 13—14 ст. у працэсе фарміравання агульнадзярж. саслоўяў і органаў саслоўнага прадстаўніцтва (парламент у Англіі, Ген. штаты ў Францыі, *картэсы* ў Іспаніі, *Сейм* у ВКЛ, Польшчы, Чэхіі і інш.). Саслоўнае прадстаўніцтва ў выглядзе *Земскіх сабораў* у 16—17 ст. існавала і ў Расіі. Звычайна С.м. гістарычна папярэднічала *абсалютызму*. У Рэчы Паспалітай (у складзе ВКЛ і Польшчы) абсалютызм не склаўся да канца яе існавання.

САСНА́, тое, што *хвоя*.

САСНА́ (Сосна) Рыгор Афанасьевіч (н. 30.4.1939, в. Шэрні Падляскага ваяв., Польшча), бел. гісторык, краязнавец і грамадскі дзеяч у Польшчы. Магістр багаслоўя (1966). Скончыў Хрысціянскую тэалагічную акадэмію ў Варшаве (1963). Служыў святаром у бел. правасл. прыходах Беласточчыны, з 1987 настаяцель прыхода ў в. Рыбалы. Вывучае гісторыю правасл. царквы ў Польшчы, бібліяграфію ўсх. хрысціянства, польскі друк пра Беларусь. Падрыхтаваў і выдаў зб-кі дакументаў «Праваслаўная царква на Беласточчыне і адносіны да яе дзяржаўнай улады II Рэчы Паспалітай» (1991) і «Нацыянальныя і рэлігійныя справы на Беласточчыне (1944—1948) і адносіны да іх Польскай дзяржавы» (1996). Аўтар даследавання «Бібліяграфія праваслаўных прыходаў на Беласточчыне» (ч. 1—4, 1984—93), артыкулаў у рэліг. выданнях. Чл. Міжнар. асацыяцыі беларусістаў.

Л.У.Языковіч.

САСНАВІ́К Іосіф Лазаравіч (29.9.1899, в. Геленава, Міёрскі р-н Віцебскай вобл. — ?), бел. вучоны ў галіне неўрапаталогіі. Д-р мед. н. (1959), праф. (1962). Скончыў Ленінградскі мед. ін-т (1926). З 1934 у Віцебскім мед. ін-це (з 1960 заг. кафедры). Навук. працы па траўматызме нерв. сістэмы і праблемах паталогіі мазгавога кровазвароту.

Тв.: К клинике и течению тромбоза внутренней сонной артерии // Сов. медицина. 1962. № 4; Об этиопатогенезе преходящих нарушений мозгового кровообращения // Здравоохранение Белоруссии. 1969. № 11.

САСНІ́Н Георгій Пятровіч (7.2.1916, в. Зюльзя Нерчынскага р-на Чыцінскай вобл., Расія — 19.9.1999), бел. вучоны ў галіне стаматалогіі. Д-р мед. н. (1971), праф. (1972). Скончыў Маскоўскі мед. стаматалагічны ін-т (1941). У 1971—97 у Мінскім мед. ін-це (да 1988 заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях тэрапеўт. і артапедычнай стаматалогіі.

Тв.: Післяопераційне протезування зубів і щелеп. Київ, 1960; Замещение дефектов зубных рядов съемными протезами. Опирающиеся (бюгельные) протезы // Руководство по ортопедической стоматологии. М., 1974; Бюгельные протезы. Мн., 1981.

САСНО́ВЕЦ (Sosnowiec), горад на Пд Польшчы, у Верхнесілезскай агламерацыі, у Шлёнскім ваяводстве. Каля 300 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Цэнтр вугальнай і металургічнай прам-сці. Развіты таксама горнае машынабудаванне, тэкст. (шарсцяная), швейная, харч. прам-сць. Горны музей.

САСНО́ВЫ БОР, рабочы пасёлак у Светлагорскім р-не Гомельскай вобл. За 16 км на ПдЗ ад Светлагорска, 126 км ад Гомеля, 4 км ад чыг. ст. Жэрдзь на лініі Жлобін—Калінкавічы, на аўтадарозе, якая злучае С.Б. са Светлагорскам. 2,5 тыс. ж. (2001).

Узнік як пасёлак у 1955 у сувязі з буд-вам торфапрадпрыемства «Васілевічы 2-я» (з 1959 «Светлагорскае»). 3.7.1959 пераўтвораны ў рабочы пасёлак.

Працуюць з-д «Светлагорсккормаш» (філіял ВА «Гомсельмаш»), сумеснае бел.-герм. прадпрыемства «Сасновы Бор», акц. т-ва «Светлбытсервіс»; сярэдняя і дзіцячая муз. школы, дашкольная ўстанова, Дом культуры, б-ка, бальніца, паліклініка, аптэка, спарт. комплекс, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

САСНО́ВЫЯ ЛЯСЫ́, тое, што *хваёвыя лясы*.

САСНО́ЎКА, рака ў Клімавіцкім р-не Магілёўскай вобл., левы прыток р. *Асцёр* (бас. р. Дняпро). Даўж. 39 км. Пл. вадазбору 201 км². Пачынаецца за 3 км на З ад в. Склімін, вусце на ўскраіне в. Хадунь. Цячэ па паўд.-ўсх. ускраіне Аршанска-Магілёўскай раўніны. Даліна трапецападобная, шыр. 0,5—1,5 км. Пойма двухбаковая, месцамі чаргуецца па берагах, шыр. 100—200 м, у сярэднім і ніжнім цячэнні пашыраецца да 500 м. Рэчышча на працягу 15 км каналізаванае, на астатніх участках звілістае, шыр. 5—10 м, у вярхоўі перасыхае.

САСНО́ЎСКАЕ ВО́ЗЕРА. У Шумілінскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Зах. Дзвіна, за 8 км на З ад г.п. Шуміліна. Пл. 0,29 км², даўж. 1,1 км, найб. шыр. 420 м, найб. глыб. 7,6 м, даўж. берагавой лініі 2,8 км. Пл. вадазбору 1,28 км². Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы выш. 2—5 м, спадзістыя, разараныя, на ПнУ пад хмызняком. Берагі нізкія, пясчаныя, на ПнУ тарфяныя. Дно да глыб. 2—2,5 м пясчанае, да 4—4,5 м укрыта апясчаненым ілам, глыбей гліністым ілам і сапрапелем. Уздоўж берагоў зарастае.

САСНО́ЎСКАЕ РАДО́ВІШЧА НА́ФТЫ. У Светлагорскім р-не Гомельскай вобл., за 3 км на ПдЗ ад р.п. Сасновы Бор. Адкрыта ў 1973, распрацоўваецца з 1973. Пл. нафтаноснасці 11 км². Паклады нафты прымеркаваны да міжсалявых і падсалявых адкладаў верхняга дэвону. Размешчана на Пн Прыпяцкага прагіну ў межах Рэчыцка-Вішанскай тэктанічнай зоны, паміж Давыдаўскім і Асташкавіцкім радовішчамі. Глыб. залягання нафтаносных гарызонтаў 2726—3291 м. Пароды-калектары — каверна-ва-порава-трэшчынныя даламіты і даламітызаваныя вапнякі. Нафта маласмалістая, маласярністая, парафінавая, шчыльн. 784—865 кг/м³. Пач. геал. запасы — 3,5 млн. т, здабываемыя — 1,4 млн. т. *І.Р.Захарыя.*

САСНО́ЎСКІ Аляксандр Цімафеевіч (22.10.1923, в. Каралёў Стан Мінскага р-на — 21.11.1996), бел. вучоны ў галіне дэрматавенералогіі. Д-р мед. н. (1971), праф. (1972). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1951). З 1955 у БелНДІ скурных і венералагічных хвароб, з 1963 у Мінскім мед. ін-це (у 1970—86 заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях эксперым. сіфілісу, тэрапіі герпесу, вострых прамянёвых дэрматытаў і хірургіі іх хранічных форм, дыягностыцы цяжкіх для распазнавання захворванняў скуры.

Тв.: Лучевые дерматиты. Мн., 1974; Дерматологический справочник. Мн., 1992 (разам з М.З.Ягоўдзікам).

САСНО́ЎСКІ Леанід Адамавіч (н. 25.7.1935, в. Палессе Чачэрскага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне прыкладной механікі, адзін з заснавальнікаў трыбафатыкі. Д-р тэхн. н. (1987), праф. (1988). Засл. дз. нав. Беларусі (1998). Скончыў Ленінградскі горны ін-т (1958). З 1976 у Магілёўскім тэхнал. ін-це (з 1978 заг. кафедры), з 1980 у Бел. ун-це транспарту (у 1989—99 заг. кафедры). Навук. працы па буд. механіцы, супраціўленні матэрыялаў, тэорыі надзейнасці, механіцы стомленаснага разбурэння, тэарэт. асновы трыбафатыкі. Дзярж. прэмія Украіны 1997.

Тв.: Статистическая механика усталостного разрушения. Мн., 1987; Сопротивление усталости металлов и сплавов: Справ. Ч. 1—2. Киев, 1987 (разам з В.Т.Трошчанкам); Трибофатика: О диалектике жизни. 2 изд. Гомель, 1999; Износоусталостные повреждения и их прогнозирование (Трибофатика). Гомель, 2000 (у сааўт.).

САСТАЎНА́Я РЫ́ФМА, рыфма, у якой рыфмуюцца не адно, а два і больш слоў, што стаяць у канцы радка. Узнікла ў фальклоры, найб. пашырана ў гумарыстычных творах:

Як звалíўся камар з **высакосці** —
Паламаў, пакрышыў **свае косці**.

С.р. часта ўжываецца ў сучаснай бел. паэзіі («Перад падарожжам» А.Куляшова, «Роздум» і «Казка» С.Дзяргая, «Хочаш, вымыю кашулю, адзінокі хлопец?» Д.Бічэль-Загнетавай, «Зазімак у Юрмале», «Кашуля Паўлюка Труса», «Нібы раўчук...» Р.Барадуліна і інш.).

А.А.Майсейчык.

САСТАЎНО́Е ЯДРО́, ядзерная сістэма, утвораная пры *ядзернай рэакцыі* ядромішэнню і часціцай, што наляцела на яго. Ядро няўстойлівае і распадаецца на канчатковыя прадукты рэакцыі праз кароткі час (сярэдні час жыцця ад 10^{-22} да 10^{-21} с). Уяўленне аб С.я. выказана Н.*Борам* (1936).

Энергія, прынесеная часціцай, размяркоўваецца па ступенях свабоды С.я. У выніку стат. флуктуацый адна ці некалькі ядз. часціц могуць набыць энергію, дастатковую, каб пакінуць узбуджанае С.я. Гэты працэс падобны на працэс выпарэння вадкасці і вядзе да распаду С.я. (аналогія прапанавана Я.І.*Фрэнкелем*).

Да арт. **Сасудзістыя хваробы раслін**. Вертыцылёзнае завяданне: 1 — сланечніку; 2 — перцу; 3 — сасудзісты бактэрыёз капусты; бактэрыяльнае завяданне: 4 — памідораў; 5 — тытуню; 6 — чорная ножка бульбы.

САСТАЎНЫ́ ЛІК, натуральны *лік*, які мае дзельнікі, адрозныя ад 1 і самога сябе (не з'яўляецца простым). Любы С.л. адзіным спосабам раскладаецца на здабытак *простых лікаў*. Гл. таксама *Падзельнасць*.

САСУ́ДЗІСТЫЯ ХВАРО́БЫ РАСЛІ́Н, парушэнні функцый сасудзістай сістэмы, якія характарызуюцца стратай *тургару* ўсёй раслінай ці яе часткай. Прычыны: недахоп вільгаці ў глебе, парушэнне дзейнасці каранёвай сістэмы, мех. закупорванне праводнай сістэмы фітапатагеннымі грыбамі ці бактэрыямі і іх таксічным уплывам, утварэнне ў сасудах пузырападобных уздуццяў, камедзі. Выяўляюцца пасвятленнем жылак ліся, пабурэннем сасудаў, утварэннем прыдаткавых каранёў на сцёблах, некрозамі. На Беларусі найб. пашыраны трахеамікозы (вертыцылёзнае завяданне памідораў, фузарыёзнае завяданне лёну, бабовых, агародніннных раслін) і трахеабактэрыёзы (чорная ножка і кальцавая гніль бульбы, сасудзісты бактэрыёз капусты, бактэрыяльны рак памідораў). Гл. таксама *Бактэрыяльныя хваробы раслін*, *Вертыцылёз*, *Фузарыёз*.

«САСУНЦЫ́ ДАВІ́Д», «Давід Сасунскі», гераічны эпас армянскага народа. Упершыню запісаны ў 1874 Г.Срвандзцянам. Складаецца з 4 адгалінаванняў: «Санасар і Багдасар», «Мгер Старэйшы», «Сасунцы Давід» (гал.), «Мгер Малодшы».

Стваралься на працягу стагоддзяў нар. казачнікамі-віпасанамі. На пачатку ўзнікнення ў аснове эпасу — паўстанне сялян 851 супраць зборшчыкаў даніны Арабскага халіфата ў Сасуне (Зах. Арменія). Гал. герой эпасу — Давід — мае некат. падабенства з кіраўніком паўстання. У эпасе знайшлі водгук і пазнейшыя гіст. падзеі. Асн. сюжэтная лінія — барацьба за вызваленне радзімы. Героі эпасу — носьбіты справядлівасці, мужнасці, гераізму, сапраўднага патрыятызму. «С.Д.» вызначаецца велічнасцю вобразаў, дынамізмам дзеяння, трапнасцю і лаканічнасцю мовы.

Публ.: Рус. пер. — Давид Сасунский. М., 1958.

Літ.: Давид Сасунский: Юбилейный сб., посв. 1000-летию эпоса. Ереван, 1939; Зарьян Н.Е. Давид Сасунский: Повесть по мотивам арм. эпоса. М., 1972.

САСЫККО́ЛЬ, Гнілое возера, возера ў Сяміпалацінскай і Талды-Курганскай абл. Казахстана, на У ад воз. Балхаш. Размешчана ў Балхаш-Алакольскай катлавіне на выш. 347 м. Пл. 736 км^2. Глыб. да 4,7 м. Плошча і глыбіня зменлівыя. Берагі нізінныя, ва ўсх. ч. моцна забалочаныя. Замярзае ў ліст., крыгалом у красавіку. Упадаюць рэкі Тэнтэк і Каракол; пратокай злучана з воз. Уялы. У мнагаводныя гады С. зліваецца з азёрамі Уялы і Алаколь у адзін вадаём. Рыбалоўства. Промысел андатры.

САСЮ́Р (Saussure) Арас Бенядзікт (17.2.1740, г. Жэнева, Швейцарыя — 22.1.1799), швейцарскі прыродазнавец, адзін з заснавальнікаў апісальнай геалогіі. У 1762—86 праф. натурфіласофіі ў Жэневе. Першым даследаваў геал. будову Альпаў, ахарактарызаваў пашыраныя там горныя пароды і ўмовы іх заляганя. Навук. працы па батаніцы, метэаралогіі, руху ледавікоў і інш. Яго імем названы тонказярністы агрэгат мінералаў — сасюрыт.

САСЮ́Р (Saussure) Нікала Тэадор (14.10.1767, г. Жэнева, Швейцарыя — 18.4.1845), швейцарскі аграхімік і фізіёлаг раслін. Чл.-кар. Парыжскай АН (1808), чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1820). З 1802 праф. Жэнеўскага ун-та. Навук. працы па фізіцы, хіміі, геалогіі, фізіялогіі раслін. Вывучаў фізіялогію прарастання насення, ператварэнне крухмалу ў цукар, браджэнне. Упершыню выкарыстаў метады колькаснага хім. аналізу пры вывучэнні газаабмену і мінер. жыўлення раслін. Эксперыментальна паказаў засваенне раслінамі на святле вугляроду з вуглякіслага газу з выдзяленнем кіслароду, і што ў працэсе дыхання расліны, як і жывёлы, паглынаюць кісларод і выдзяляюць вуглякіслы газ.

САСЮ́Р (Saussure) Фердынанд Манжын дэ (26.11.1857, Жэнева — 22.2.1913), швейцарскі мовазнавец. Вучыўся ў Жэнеўскім (1875), Лейпцыгскім, Берлінскім (1876—80) ун-тах. З 1881 праф. Парыжскага, з 1906 Жэнеўскага ун-таў. Даследаваў паходжанне індаеўрап. вакалізму («Пра першапачатковую сістэму галосных у індаеўрапейскіх мовах», 1879). У працах па літ. акцэнталогіі (1894—96) вызначыў (адначасова з П.*Фартунатавым*, але незалежна ад яго) характар націску і інтанацыі слова ў балт. мовах у суадносінах з аналагічнымі з'явамі ў слав. мовах (закон Фартунатава — дэ Сасюра). Самая значная праца С. — «Курс агульнай лінгвістыкі» (1916); у ёй выкладзены яго навук. погляды на мову як сістэму знакаў; прапанаваў стварыць спец. навуку пра знакі — *семіётыку*, увесці адрозненні паняццяў «мова» і «маўленне» і інш. Тэарэт. прынцыпы С. ў дастасаванні да мовы сталі метадалагічнай асновай розных кірункаў *структурнай лінгвістыкі*.

Літ.: Слюсарева Н.А. Теория Ф. де Соссюра в свете современной лингвистики. М., 1975.

САСЮ́РА Уладзімір Мікалаевіч (6.1.1898, г. Дзябальцава Данецкай вобл., Украіна — 8.1.1965), украінскі паэт. Вучыўся ў харкаўскіх Камуніст. ун-це імя Арцёма (1922—23) і Ін-це нар. асветы (1923—25). Друкаваўся з 1917. Аўтар зб-каў паэзіі «Чырвоная зіма» (1922), «Юнацкасць» (1927), «Днепральстан» (1930), «Новыя вершы» (1937), «Жураўлі прыляцелі» (1940), «У гадзіну гневу» (1942), «Каб сады шумелі» (1947, Дзярж. прэмія СССР 1948), «За мір» (1953), «На струнах сэрца» (1955), «Так ніхто не кахаў» і «Ластаўкі на сонцы» (абодва 1960), «Шчасце сям'і працоўнай» (1962, Дзярж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1963), «Асеннія мелодыі» (1964). Паэзіі С. ўласцівы глыбокая лірычнасць, філас. скіраванасць, дакладнасць і выразнасць. На ўкр. мову пераклаў асобныя творы Я.Купалы, Я.Коласа, А.Александровіча, А.Астрэйкі, П.Броўкі, К.Буйло, В.Віткі, П.Глебкі, М.Лужаніна, П.Панчанкі, П.Пестрака, М.Танка, В.Таўлая. На бел. мову творы С. перакладалі Броўка, Ю.Гаўрук, У.Дубоўка, А.Вялюгін, М.Лужанін, Я.Семяжон, М.Танк. Пра яго творчасць пісалі Броўка, А.Куляшоў, М.Аўрамчык, Вялюгін, М.Лужанін, М.Танк.

У.М.**Сасюра**.

Тв.: Твори. Т. 1—10. Київ, 1970—72; Бел. пер. — Выбранае. Мн., 1960; Рус. пер. — Избранное. М., 1978; Стихотворения и поэмы. Л., 1982.

Літ.: Бурляй Ю.С. Володимир Сосюра. Київ, 1959; Радченко Е. Володимир Сосюра: Літ.-критич. нарис. Київ, 1967.

В.А.Чабаненка.

СА́ТА Эйсаку (27.3.1901, прэфектура Ямагуты, Японія — 3.6.1975), дзяржаўны дзеяч Японіі. Скончыў Такійскі ун-т (1924). Юрыст. З 1924 у мін-ве чыгунак. З 1948 чл., з 1953 ген. сакратар Ліберальнай партыі, з 1957 старшыня выканкома *Ліберальна-дэмакратычнай партыі* Японіі. У 1950—60-я г. ўзначальваў шэраг міністэрстваў. У 1964—72 прэм'ер-міністр Японіі. Гал. кірунак знешняй палітыкі яго ўрада — паляпшэнне адносін Японіі з краінамі Усх. і Паўд.-Усх. Азіі, якія пацярпелі ад яп. агрэсіі ў 2-ю сусв. вайну. Дамогся ад ЗША вяртання ў 1972 а-воў Акінава і Агасавара. Нобелеўская прэмія міру 1974 (з Ш.*Макбрайдам*).

САТАНІ́-ДАР, Сатанідар, раннепалеалітычная стаянка на паўд.-зах. схіле гары *Арагац* у Арменіі. Даследавана ў 1945—49. Выяўлена шмат прылад з абсідыяну і базальту — адшчэпаў, рубіл, грубых сякучых прылад, а таксама нуклеусаў грубадыскападобнай і кубападобнай формы. Вылучаюць 2 яго комплексы: найб. старажытны датуюць позняшэльскім часам (гл. *Шэль*), больш позні — позняашэльскім (гл. *Ашэль*).

САТАНІ́НСКІ ГРЫБ (Boletus satanas), грыб сям. балетавых. Пашыраны на Каўказе, у Зах. Еўропе, Паўн. Амерыцы. Трапляецца ў ліцевых лясах.

Пладовае цела — шапка на ножцы. Шапка дыяметрам 8—20 см, таўшчынёй 5 см, спачатку паўшарападобная, потым круглаватападушкападобная, белавата-шараватая. Трубчасты слой з доўгіх, амаль свабодных трубачак, жоўта-аліўкавы, з дробнымі, круглаваты-

мі, цёмна-чырв. порамі. Ножка даўж. 6—10 см, таўшчынёй 5—6 см, звужаная каля асновы і ўздутая пасярэдзіне, з вянознай, цёмна-чырв. сеткаватасцю на паверхні. Мякаць белая, салодкая, з пахам сырой бульбы, на зломе сінее ці зелянее. Неядомы.

САТКІЛА́ВА Зураб Лаўрэнцьевіч (н. 12.3.1937, г. Сухумі, Грузія), грузінскі і расійскі спявак (лірыка-драм. тэнар). Нар. арт. СССР (1979). Скончыў тбіліскія політэхн. ін-т (1960) і кансерваторыю (1965). З 1965 саліст Грузінскага т-ра оперы і балета, з 1974 — Вял. т-ра Расіі. Выкананне адметнае тэмпераментам і задушэўнасцю. Сярод лепшых партый: Атэла («Атэла» Дж.Вердзі), Хазе («Кармэн» Ж.Бізэ), Арзакан («Выкраданне Месяца» А.Тактакішвілі). 1-я прэмія і Гран-пры на Міжнар. конкурсе вакалістаў імя Ф.Віньяса (1970), 2-я прэмія на Міжнар. конкурсе імя П.Чайкоўскага (1970). Дзярж. прэмія Грузіі 1983.

СА́ТЛЕДЖ, Сатладж (у ніжнім цячэнні наз. Панджнад), рака ў Пакістане, Індыі і Кітаі, самы буйны (левы) прыток р. Інд. Даўж. 1450 км, пл. басейна 395 тыс. км^2. Вытокі на Тыбецкім нагор'і, на схілах хр. Кайлас. У вярхоўях цячэ па шырокай даліне ўздоўж паўн. падножжа Гімалаяў, перасякае іх у вузкай цясніне, потым выходзіць на раўніну Пенджаба і цячэ па ёй да вусця. Асн. прытокі: Біяс і Чынаб (справа). Сярэдні расход вады каля г. Рупар каля 500 м^3/с, макс. летам (каля 20 тыс. м^3/с). Гідратэхн. комплекс Бхакра-Нангал (Індыя). У межах Пенджаба ад С. адыходзяць буйныя арашальныя каналы. Суднаходная ў разводдзе на асобных участках. На С. — гарады Нангал, Лудхіяна (Індыя), Бахавалпур (Пакістан).

САТПА́ЕЎ Каныш Імантаевіч (11.4.1899, аул Паўладарскай вобл., Казахстан — 31.1.1964), казахскі геолаг. Акад. АН СССР (1946; чл.-кар. 1943). Акад. АН Казахстана (1946). Скончыў Томскі тэхнал. ін-т (1926). З 1926 у геал. разведачнай партыі трэста «Атбасаркалярмет», дзе займаўся разведкай і даследаваннем радовішчаў каляровых металаў, у т.л. Джэзказганскага меднага радовішча. З 1941 дырэктар Ін-та геал. навук Каз. філіяла АН СССР (з 1946 — АН Казахстана), адначасова з 1942 старшыня Прэзідыума Каз. філіяла АН СССР, у 1946—52 і з 1955 прэзідэнт АН Казахстана. Навук. працы па геалогіі рудных радовішчаў і мінер. рэсурсаў Казахстана. Ленінская прэмія 1958. Дзярж. прэмія СССР 1942. Яго імем названы мінерал сатпаевіт.

Тв.: Избр. труды. Т. 1—5. Алма-Ата, 1967—70.

САТРА́П (грэч. satrapēs ад стараж.-перс. хшатрапаван — захавальнік вобласці), намеснік *сатрапіі*, галава яе адміністрацыі. Меў вял. самастойнасць у справах кіравання сатрапіяй, камандаваў яе войскам, збіраў падаткі, чаканіў сярэбраныя і залатыя манеты. У пераносным сэнсе С. — жорсткі начальнік любой адм.-тэр. адзінкі, самадур.

САТРАПЕ́ЗНІЦТВА ў біялогіі, адносіны арганізма з асяроддзем, тое, што *каменсалізм*.

САТРА́ПІЯ, ваенна-адм. адзінка (правінцыя, якую ўзначальваў *сатрап* у персідскай *Ахеменідаў дзяржаве*). У канцы 6 ст. да н.э. *Дарый I* падзяліў дзяржаву на 20 сатрапій, потым іх колькасць і межы часта мяняліся. Кожная з С. плаціла вызначаную даніну і магла мець уласныя законы і афіц. мову (ці мовы). Як адм. адзінка С. захоўвалася ў дзяржавах Аляксандра Македонскага, Селеўкідаў, Сасанідаў, Парфянскім царстве.

СА́ТУ-МА́РЭ (Satu Mare), горад на ПнЗ Румыніі, на р. Самеш. Адм. ц. аднайм. жудзеца. Каля 150 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд. (вытв-сць абсталявання для горназдабыўной і хім. прам-сці), хім., у т.л. лакафарбавая; мэблевая, тэкст., швейная, харчовая. Музей.

САТУ́РН, адзін з найстараж. рым. багоў. Атаясамліваўся са стараж.-грэч. богам *Кронасам*. Паводле міфаў, С. быў пазбаўлены ўлады над сусветам сваім сынам *Юпітэрам*, пасля чаго стаў адным з першых цароў італьян. вобласці Лацый, дзе потым узнік Рым. Лічылася, што ён навучыў сваіх падданых земляробству, вінаградарству і цывілізаванаму жыццю. У яго гонар наладжваліся штогадовыя святы — *сатурналіі*.

САТУ́РН, планета Сонечнай сістэмы, шостая па парадку ад Сонца і другая па памерах і масе. Астр. знак ♄. Адносіцца да класа планет-гігантаў.

Сярэдняя адлегласць ад Сонца 1,43 млрд. км (эксцэнтрысітэт арбіты 0,056). Перыяд абарачэння вакол Сонца 29,46 зямнога года. Экватарыяльны дыяметр 120 536 км; з прычыны хуткага вярчэння вакол восі (перыяд каля 10,53 гадз) С. значна сплюснуты — палярны радыус меншы за экватарыяльны прыблізна на 6500 км. Маса $5{,}68 \cdot 10^{26}$кг. Сярэдняя шчыльнасць — самая малая з усіх планет, 700 кг/м^3 (прыблізна ўдвая менш за шчыльнасць Сонца). З Зямлі С. выглядае як жаўтаватая зорка, бляск якой мяняецца ад 0-й да 1-й візуальнай зорнай велічыні. С. з'яўляецца газавадкім целам у стане гідрастатычнай раўнавагі і не мае цвёрдай паверхні. Вонкавая газавая абалонка вадародна-геліевая, за ёй знаходзіцца абалонка ў асноўным з вадкага вадароду, потым — з металічнага вадароду. С. мае ўнутр. крыніцы энергіі і выпрамяняе ў 2,5 раза больш энергіі, чым атрымлівае ад Сонца; т-ра ў нетрах 12000 К. На С. назіраюцца воблакі, т-ра іх верхняй часткі каля -175°С. Вось магн. поля амаль супадае з воссю вярчэння планеты. Напружанасць магн. поля на экватары роўная 0,7 зямной, унутр. магн. поле значна большае за зямное з-за вял. памераў. У сістэму С. ўваходзяць *кольцы Сатурна* і 18 спадарожнікаў (гл. *Спадарожнікі планет*); выяўлены *радыяцыйныя паясы*. Большасць звестак пра С. атрымана пры дапамозе аўтам. міжпланетных станцый «*Піянер*» і «*Вояджэр*».

Літ.: Маров М.Я. Планеты Солнечной системы. 2 изд. М., 1986; Система Сатурна: Пер. с англ. М., 1990. *А.А.Шымбалёў.*

Планета **Сатурн**.

«САТУ́РН» (Saturn), серыя амер. *ракетносьбітаў* (РН), створаных у 1964—67 па праграме «*Апалон*».

«С.-1» — эксперым. 2-ступеньчатая РН. «С.-1В» — 2-ступеньчатая РН, прызначаная для запуску на каляземную арбіту непілатуемых і пілатуемых касм. караблёў (КК) «Апалон». «С.-5» — 3-ступеньчатая РН для запуску пілатуемых КК «Апалон» на калямесяцавую арбіту, уключаючы высадку касманаўтаў на Месяц. Стартавая маса (разам з КК) да 2950 т. Даўжыня (з карысным грузам і сістэмай аварыйнага выратавання) 110,7 м, дыяметр (без стабілізатараў) 10,1 м. Макс. маса грузу, выведзенага на каляземную арбіту, 142,5 т. У 1967—73 здзейснена 13 пускаў «С.-5» (12 з КК «Апалон» і 1 з арбітальнай станцыяй «*Скайлэб*»). Запускаюцца з касмадрома на мысе Канаверал. *У.С.Ларыёнаў.*

САТУРНА́ЛІІ (лац. Saturnalia), у Старажытным Рыме штогадовыя святы ў гонар бога *Сатурна*. Наладжваліся пасля збору ўраджаю ў час зімовага сонцастаяння. Суправаджаліся карнавалам, у час якога рабы «ўраўноўваліся» са сваімі гаспадарамі і нават абслугоўваліся імі, бедным грамадзянам раздаваліся грошы. Рытуал С., у т.л. звычай рабіць адзін аднаму падарункі, захаваўся ў *калядах* і абрадах хрысц. свята Божага нараджэння.

Сатанінскі грыб.

САТУРНІ́ІДЫ, сямейства матылёў, гл. *Паўлінавочкі*.

Да арт. **«Сатурн»**. *а* — запуск 3-ступеньчатай ракеты-носьбіта «Сатурн-5»: 1 — момант старту, 1-я ступень уключаецца на поўную магутнасць; 2 — 1-я ступень выгарае і адпадае; 3 — 2-я ступень выгарае і адпадае; 4 — 3-я ступень выносіць карысны груз у касмічную прастору; *б* — агульны выгляд.

САТЫ́РА (лац. satira ад больш ранняга satura сумесь), востpае, знішчальнае асмяянне грамадскіх з'яў, выкрыццё заган; эмацыянальна-эстэт. форма крытыкі; від *камічнага*. Адрозні́ваецца ад *гумару* асуджальным пафасам, рэзка негатыўнай ацэнкай аб'екта асмяяння. Характарызуецца паліт. злабадзённасцю, тэндэнцыйнасцю, публіцыстычнай накіраванасцю. Рэалізуецца ў розных відах мастацтва: выяўл. (*карыкатура*, *шарж*), т-ры і кіно (сатыр. *камедыя*) і інш., найб. пашырана ў л-ры. У Стараж. Рыме С. наз. асобны жанр лірыкі, у якім выкрываліся паліт., грамадскія і літ. з'явы (Гарацый, Ювенал). Пазней паняцце «С.» пашырылася на творы інш. жанраў. Асн. жанры С.: *эпіграма* (Марцыял, Г.Лесінг, Р.Бёрнс, А.С.Пушкін), сатыр. камедыя (Арыстафан, Мальер, Б.Брэхт, А.С.Грыбаедаў), *памфлет* (Эразм Ратэрдамскі, Д.Дэфо, Дж.Свіфт, Вальтэр), *фельетон* (Г.Гейнэ, М.Булгакаў, М.Зошчанка). С. як эстэт. катэгорыю ўпершыню разглядаў Ф.Шылер, які разумеў пад гэтым паняццем усе праявы камічнага. Размежаванне С. і гумару як процілеглых відаў камічнага вызначалася ў эстэтыцы рамантызму (Жан Поль). Г.Гегель адмаўляў маст. вартасць С. У сав. эстэтыцы і літаратуразнаўстве С. як грамадска актыўная праява камічнага лічылася яго найвышэйшай формай (Ю.Б.Бораў, А.З.Вуліс, Дз.П.Нікалаеў, Я.Я.Эльсберг). М.М.Бахцін лічыў С. літ. з'явай Новага часу, не ўласцівай літаратуры папярэдніх эпох і нар. культуры. У бел. л-ры элементы С. адзначаюцца з 16—17 ст. («Прамова Мялешкі», «Ліст да Абуховіча», асобныя творы С. Зізанія, Л.Карповіча, Хрыстафора Філалета). Да С. звярталіся В.Дунін-Марцінкевіч, Ф.Багушэвіч, Я.Купала, Я.Колас, К.Каганец, У.Галубок, А.Мрый, М.Танк, Н.Гілевіч, Р.Барадулін і інш.; С. вызначае асн. кірунак творчасці К.Крапівы, А.Макаёнка, У.Корбана і інш. Праблемы С. даследуюцца на Беларусі пераважна ў межах літаратуразнаўства (Дз.Я.Бугаёў, Л.М.Гарэлік, Я.Казека, Я.К.Усікаў), мастацтвазнаўства (Ю.М.Сохар, В.Ф.Шматаў), фальклярыстыкі (А.С.Фядосік).

Літ.: Дземидок Б. О комическом: Пер. с пол. М., 1974; Жан Поль. Приготовительная школа эстетики: Пер. с нем. М., 1981; Гарэлік Л.М. Сатыры слова гнеўнае: Некаторыя асаблівасці бел. сав. сатырыч. паэзіі. Мн., 1989; Пропп В.Я. Проблемы комизма и смеха. 2 изд. СПб., 1997.

Л.Г.Кісялёва.

САТЫ́РЫ, у старажытнагрэчаскай міфалогіі лясныя божышчы, дэманы ўрадлівасці, якія складаюць світу бога *Дыяніса*. Іх уяўлялі як пакрытых поўсцю доўгавалосых, барадатых напаўлюдзей-напаўзвяроў: галовы і тулавы чалавечыя, але конскія або казліныя ногі з капытамі і конскія хвасты; на галовах рожкі або конскія вушы. Сімвалам іх невычарпальнай урадлівасці лічыўся фалас. Яны, заўсёды напаўп'яныя, нахабныя і юрлівыя, ганяюцца за *німфамі* або разам з імі бадзяюцца па лясах і наладжваюць вясёлыя карагоды.

САТЫ́РЫ, матылі, гл. *Аксамітніцы*.

САТЫРЫ́ЯЗ (грэч. satyriasis ад satyros сатыр), паталагічнае павышэнне палавой цягі ў мужчын; адна з форм *гіперсексуальнасці*. Праяўляецца пастаянным пачуццём палавога незадавальнення і нястрымным імкненнем да палавых зносін. Бывае праявай гарманальных парушэнняў, арган. паталогіі ц.н.с., вынікам псіхагенных уздзеянняў.

САТЫСФА́КЦЫЯ (лац. satisfactio задавальненне), 1) задавальненне ў форме дуэлі, паядынку, якое ў мінулым давалася абражальнікам па патрабаванні абражанага для абароны гонару. 2) Форма міжнародна-прававой адказнасці, пры якой дзяржава-парушальнік дае задавальненне пацярпелай дзяржаве. Віды С.: выказванне спачування, публічнае прабачэнне, пакаранне вінаватых, аказанне асобых шанаванняў пацярпелай дзяржаве і да т.п. Іх выкарыстанне залежыць ад нанесенай шкоды і канкрэтнай паліт. сітуацыі.

САТЭЛІ́Т [ад лац. satelles (satellitis) спадарожнік, паплечнік], 1) у Стараж. Рыме — узброены найміт, які суправаджаў свайго гаспадара. 2) Спадарожнік планеты (напр., Месяц — С. Зямлі). 3) Дзяржава або ўрад, фармальна незалежныя, а фактычна падпарадкаваныя інш., больш моцнай дзяржаве. 4) Шасцярня ў механізме, якая круціцца разам з воссю вакол цэнтр. кола накшталт спадарожніка планеты. 5) У пераносным значэнні С. наз. залежную, падначаленую асобу, што выконвае чужую волю, паслугача.

САТЭРЛЕНД (Sutherland Falls), вадаспад на р. Артур на Паўднёвым в-ве Новай Зеландыі. Выш. 580 м. У складзе нац. парку Ф'ёрдленд, што ўваходзіць у нац. парк Тэ Вахіпунаму, уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

САТ'ЯГРА́ХА (санскр. літар. — упартасць у ісціне), форма грамадска-паліт. барацьбы ненасільнага характару ў калан. Індыі, распрацаваная М.К.*Гандзі*. Уяўляла сабой масавае несупрацоўніцтва індыйцаў з калан. ўладамі, што ўключала дэманстрацыі, байкот брыт. устаноў і тавараў, адмову ад выплаты падаткаў (як апошняя мера). Упершыню выкарыстана індыйцамі-эмігрантамі ў Паўд. Афрыцы ў пач. 20 ст. ў барацьбе за свае правы, у 1920—30-я г. — гал. форма барацьбы *Індыйскага нацыянальнага кангрэса* супраць брыт. калан. панавання ў Індыі.

САЎДАЎСКАЯ АРА́ВІЯ, Каралеўства Саудаўская Аравія (араб. Аль-Мамляка аль-Арабія ас-Саудыя), дзяржава ў Паўд.-Зах. Азіі на *Аравійскім паўвостраве*. Мяжуе на Пн з Іарданіяй, Іракам, Кувейтам, на ПдУ з Катарам і Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, на Пд з Емяненам і Аманам. На ПдЗ абмываецца Чырвоным м., на ПнУ — Персідскім зал. Пл. 2,24 млн. км^2 (паводле інш. звестак ад 1,6 млн. км^2 да 2,4 млн. км^2; межы С.А. праходзяць па пустынях і дакладна не вызначаны). Нас. 22 023 тыс. чал. (2000). Дзярж. мова — арабская. Дзярж. рэлігія — іслам. Сталіца — г. *Эр-Рыяд*. Краіна падзяляецца на 13 правінцый. Нац. свята — Дзень абвяшчэння каралеўства (23 вер.).

Дзяржаўны лад. С.А. — абсалютная тэакратычная манархія. Кіраўнік дзяржавы і духоўны кіраўнік — кароль, які адначасова з'яўляецца прэм'ер-міністрам, галоўнакамандуючым узбр. сіламі і вярх. суддзёй. Выканаўчы орган — Савет Міністраў, членаў якога назначае кароль. Дзейнічае Кансультатыўны савет (90 членаў, назначаюцца каралём на 4 гады), які выпрацоўвае рэкамендацыі ўраду па пытаннях сац.-эканам. развіцця краіны, дае заключэнні па прававых актах і міжнар. пагадненнях.

Прырода. Большую частку краіны займае пласкагор'е выш. ад 200—300 м на У да 1000—1300 м на З, складзена з крышт. парод. Уздоўж Чырвонага м. горы Асіра і Хіджаза з г. Джабаль-Сауда (3353 м), прыбярэжная раўніна Тыхама.

Каля Персідскага зал. нізіна Эль-Хаса. Ва ўнутр. раёнах пустыні *Вялікі Нефуд*, Малы Нефуд, *Руб-эль-Халі*. Вял. запасы нафты — 35,8 млрд. т (25% сусв. запасаў, 1-е месца ў свеце) і прыроднага газу (5-е месца ў свеце) на У, каля ўзбярэжжа і на шэльфе Персідскага зал. Ёсць жал., свінцова-цынкавыя, медныя, залатыя і сярэбраныя руды, каменная соль і інш. Клімат на Пн субтрапічны, на Пд трапічны. Лета гарачае, сухое, зіма цёплая. Сярэдняя т-ра студз. 10—20°С, ліп. 30—35 °С. Ападкаў каля 100 мм за год, у гарах да 400 мм. Бываюць пясчаныя буры (самумы). Рэк няма, шмат сухіх рэчышчаў (вадзі). Гасп. значэнне маюць падземныя воды. Расліннасць пустынная і паўпустынная, разрэджаная. Характэрны паўхмызнякі (палын, астрагал) і травы; у аазісах — дрэвавая расліннасць (аравійская акацыя, міра, фінікавая пальма, фруктовыя дрэвы і інш.). Для жывёльнага свету характэрны грызуны, змеі, яшчаркі, драпежныя птушкі. Сустракаюцца антылопы, газелі, дзікі асёл, гепарды, шакалы, гіены. Ёсць ачагі саранчы. Нац. парк Асір.

Герб і сцяг **Саудаўскай Аравіі**.

Насельніцтва. Каля 95% складаюць арабы, у т.л. каля 82% — саудаўскія арабы, каля 13% — арабы з Емена, Амана, Іарданіі і інш. Жывуць таксама іранцы, афрыканцы, выхадцы з Пакістана і Індыі, групы еўрапейцаў і амерыканцаў. Карэннае насельніцтва падзяляецца на плямёны, ёсць качэўнікі-бедуіны і паўкачэўнікі. Сярэднегадавы прырост больш за 3%. Сярэдняя шчыльн. каля 10 чал. на 1 км^2, у аазісах і прамысл. раёнах да 50—100 чал. на 1 км^2, у пустынях каля 1 чал. на 1 км^2. У гарадах 85% насельніцтва. Найб. гарады (млн. ж., 1998): Эр-Рыяд — 2,6, Мекка — 1,5, Джыда — 1,5, Медына — 0,5. У прам-сці, буд-ве і здабычы нафты занята 25% працаздольнага насельніцтва, у сельскай гаспадарцы — 5%, у кіраванні — 40%, у абслуговых галінах — 30%. У краіне працуе некалькі мільёнаў замежных рабочых.

Гісторыя. Аравійскі п-аў з'яўляецца радзімай семіцкіх плямён. Ужо ў 2-м тыс. да н.э. большасць паўвострава засялялі стараж.-араб. плямёны. У 1-м тыс. да н.э. тут складаліся першыя дзяржавы: Мінейскае, Сабейскае, Хім'ярыцкае царствы. У 4—6 ст. н.э. ў Аравіі фарміравалася адзіная араб. народнасць адначасова з узвышэннем вобл. Хіджаз на З Аравіі. У пач. 7 ст. ў Хіджазе ўзнікла новая рэлігія — *іслам*, які здолеў аб'яднаць араб. плямёны. У выніку арабскіх заваяванняў створана вял. дзяржава — Арабскі халіфат (гл. *Халіфат*) са сталіцай у Медыне. Каля 660 халіф *Муавія I* перанёс сталіцу халіфата з Медыны ў Дамаск, пасля чаго Аравія страціла становішча цэнтра дзяржавы. У пач. 16 ст. туркі-асманы ўсталявалі кантроль над зах. р-намі Аравіі — Хіджазам і ч. Асіра, а ў 19 ст. англічане падпарадкавалі паўд. і ўсх. ўзбярэжжа. Але цэнтр. вобласці захавалі сваю незалежнасць. У пач. 18 ст. ў Недждзе, у аазісе Дэрыя, каля сучаснага Эр-Рыяда ўзнік эмірат на чале з дынастыяй Саўдыдаў, якую засн. Сауд (п. 1725). Яго сын Мухамед ібн Сауд у 1745 падтрымаў рэліг. рэфарматара Мухамеда ібн Абд-аль-Вахаба, заснавальніка рэліг.-паліт. руху вахабізму. Пад сцягам вахабізму Саўдыды аб'ядналі Неджд і заваявалі б.ч. Аравіі. У 1811—18 войскі правіцеля Егіпта *Мухамеда Алі* разгромілі дзяржаву *вахабітаў*. У 1842 Саўдыды аднавілі свой эмірат са сталіцай у Эр-Рыядзе (праіснаваў да 1891). У 1902 адзін з Саўдыдаў Абд-аль-Азіз адваяваў Эр-Рыяд і абвясціў сябе правіцелем вахабіцкай дзяржавы пад імем Ібн Сауда [1902—53]. У 1906 ён усталяваў уладу над усім Недждам, заваяваў Эль-Хасу (1913), Асір (1920) і Хіджаз (1925). У 1932 усе ўладанні Ібн Сауда абвешчаны каралеўствам С.А. З 1938 амер. кампанія «Арамка» пачала тут здабычу нафты, прыбыткі ад якой сталі пасля 2-й сусв. вайны асновай эканам. росквіту С.А. Потым каралеўствам кіравалі сыны Ібн Сауда: Сауд [1953—64], Фейсал [1964—75], Халед [1975—82] і Фахд [з 1982].

З 1964 пры Фейсале пераважная ўвага аддавалася развіццю нафтавай прам-сці, будаўніцтву інфраструктуры і г.д., усталяваны кантроль над здабычай нафты; пазіцыі С.А. ўзмацніліся ва ўсім мусульм. свеце. Яе ўрад аказвае вял. фін. дапамогу інш. мусульм. краінам. *Іранаіракская вайна 1980—88* падштурхнула Саўдыдаў да пошуку і замацавання сувязей з княствамі Перс. заліва. Яны сталі ініцыятарамі стварэння ў 1981 Савета супрацоўніцтва араб. дзяржаў Перс. заліва, які аказваў дапамогу Іраку ў вайне з Іранам. У час *Кувейцкага крызісу 1990—91* С.А. выступіла супраць іракскай акупацыі Кувейта і далучылася да шматнац. кааліцыі супраць Ірака. У знешняй палітыцы С.А. арыентуецца на ЗША і зах. краіны. С.А. — чл. ААН (з 1945), Лігі араб. дзяржаў (з 1945), Савета супрацоўніцтва араб. дзяржаў Перс. заліва (з 1981). Дыпламат. адносіны паміж С.А. і Рэспублікай Беларусь усталяваны 6.6.1997.

Гаспадарка. С.А. — індустр.-агр. краіна. Эканоміка змешанага тыпу, з важнай роляй і дзярж., і прыватнага сектараў. Гал. прамысл. кампаніі ў сумесным уладанні дзяржавы і замежных карпарацый. З 1970 краіна развіваецца па пяцігадовых планах. У 1998 валавы ўнутр. прадукт (ВУП) склаў 186 млрд. дол., па 8500 дол. на чал. Структура ВУП: прам-сць 47%, сельская гаспадарка 6%, сфера паслуг 47%. Аснову эканомікі складае нафтагазавая прам-сць. У 1998 здабыта 443 млн. т нафты (3-е месца пасля ЗША і Расіі; больш за 10% сусв. здабычы). Здабыча нафты эфектыўная, яна залягае неглыбока (да 2—3 тыс. м), маласярністая, свідравіны высокадэбіт-

Да арт. **Саудаўская Аравія**. Горад Эль-Катыф.

ныя. Асн. радовішчы: *Гавар, Абкайк, Сафанія, Маніфа* і інш. на У краіны. Большая ч. прыроднага газу здабываецца на радовішчах Гавар, Сафанія, Зулуф. Працуюць 8 нафтаперапр. з-даў у Рас-Тануры, Рас-Хафджы, Джыдзе, Дахране, Эр-Рыядзе, Янбу, прадпрыемствы па звадкаванні газу на экспарт у Рас-Тануры, Абкайку, Янбу. Пераважная ч. нафты і прыроднага газу здабываецца дзярж. кампаніяй «Арамка» з удзелам амер. капіталу, кантроль над ёй ажыццяўляе дзярж. арг-цыя «Петрамін». Здабычу нафты вядуць таксама япона-араб. нафтавая кампанія АОС і амер. кампанія «Тэксака». На базе нафтагазавай сыравіны развіваецца вытв-сць аміяку, мачавіны, серы, полівінілхларыдаў, хім. угнаенняў, змазачных маслаў у Дамаме, Янбу, Джыдзе, Абкайку, Эль-Джубайлі. Вядзецца здабыча (пераважна замежнымі кампаніямі) золата, серабра, медзі, цынку, свінцу, кам. солі і інш. Вытв-сць электраэнергіі 110,1 млрд. кВт · гадз (1998). Буйныя электрастанцыі ў Джыдзе, Эр-Рыядзе, Дамаме, Дахране, Мецы, Эт-Таіфе і інш. Электраэнергія шырока выкарыстоўваецца для апраснення марской і мінер. падземнай вады. З інш. галін прам-сці найб. развіты: металургічная (металург. камбінат у Эль-Джубайлі, сталеплавільны з-д у Дамаме, вытв-сць пракату ў гарадах на У краіны, алюмінію ў Янбу і Дамаме), машынабуд. і металаапр. (зборка грузавых і легкавых аўтамабіляў у Джыдзе і Эр-Рыядзе, вытв-сць кабелю і акумулятараў у Эр-Рыядзе, суднабудаванне ў Дамаме), цэм. (Джыда, Хуфуф, Эр-Рыяд, Янбу), тэкст. (вытв-сць свяшчэнных пакрывал для паломнікаў-мусульман, трыкатажу, швейных вырабаў; Джыда, Дамам), папяровая (Джыда, Дамам, Эр-Рыяд), буд. матэрыялаў, ваен., шкляная, запалкавая. У харч. прам-сці вылучаюцца малочная, мясная, кандытарская, алейная, вытв-сць безалкагольных напіткаў, перапрацоўка фінікаў. Саматужная і паўсаматужная вытв-сць адзення і абутку, шарсцяных тканін, сярэбраных і залатых упрыгожанняў, прадметаў рэліг. культу. Марское рыбалоўства (у 1999 вылаўлена 54,1 тыс. т рыбы), здабыча крабаў, крэветак, жэмчугу, каралаў. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 130 млн. га зямлі, у т.л. каля 4,5 млн. га пад ворывам і шматгадовымі насаджэннямі (каля палавіны арашаецца), каля 125,5 млн. га пад пашай (паўпустыні і пустыні). Багарнае земляробства магчыма толькі ў гарах, найб. на ПдЗ (правінцыя Асір). Пануе буйное землеўладанне, якое спалучаецца з дробным землекарыстаннем. Гал. культура — пшаніца, валавы збор у 1998 2,4 млн. т, ураджайнасць 40,9 ц з 1 га. Вырошчваюць таксама ячмень, проса і сорга, кукурузу, люцэрну (на корм жывёле), агародніну. Трапічнае і субтрапічнае садоўніцтва (цытрусавыя, гранаты, міндаль, інжыр, персікі і інш.), вінаградарства, вырошчванне фінікавых пальмаў (штогадовы збор фінікаў каля 400 тыс. т) і кававых дрэў. Жывёлагадоўля пашавая, пераважна качавая і паўкачавая; у асн. гадуюць буйн. раг. жывёлу, вярблюдаў, авечак, коз. У 1999 пагалоўе склала (млн. галоў): буйн. раг. жывёлы 0,3, авечак 8, коз 4,4, вярблюдаў 0,4. Птушкагадоўля (у 1999 — 125 млн. курэй). У 1998 С.А. пакрывала свае патрэбы ў харч. прадуктах за кошт уласнай вытв-сці на 70%, у т.л. пшаніцай, фінікамі, мясам птушкі на 100%, інш. збожжавымі на 50%, агароднінай на 83%, фруктамі на 66%, малочнымі прадуктамі на 55%, мясам на 48%. Транспарт аўтамаб., чыг., марскі. Даўж. аўтадарог 162 тыс. км, у т.л. 69,2 тыс. км з цвёрдым пакрыццём; чыгунак 1390 км, магістральных нафтаправодаў 6,4 тыс. км, газаправодаў 2,2 тыс. км. У краіне 1,7 млн. легкавых аўтамабіляў, 1,2 млн. грузавых і аўтобусаў, 72 аэрапорты з цвёрдым пакрыццём лётнага поля, у т.л. 3 міжнар. (Эр-Рыяд, Джыда, Дахран). Гал. парты: Дамам, Эль-Джубайль, Дуба, Джыда, Джызан, Рас-Танура, Янбу. Экспарт у 1999 склаў 48 млрд. дол., імпарт 28 млрд. дол. У экспарце пераважаюць нафта і нафтапрадукты (90%) і звадкаваны газ (каля 9%), у імпарце — машыны і абсталяванне, харч. прадукты, хімікаты, трансп. сродкі, тэкстыль. Гал. гандл. партнёры: ЗША (15% экспарту, 21% імпарту), Японія (адпаведна 17% і 9%), Францыя (4% і 5%), Рэспубліка Карэя (11% экспарту), Вялікабрытанія (9% імпарту), Германія, Сінгапур, Індыя, Італія і інш. Колькасць турыстаў у 1998 больш за 3,8 млн. чал., у т.л. больш за 2 млн. паломнікаў па святых месцах ісламу (Мекка і Медына), даход ад турызму 1,46 млрд. долараў. С.А. — краіна-донар. Яна аказвае эканам. дапамогу многім слабаразвітым краінам (пераважна мусульманскім), удзельнічае ў фінансаванні міжнар. фондаў развіцця. Грашовая адзінка — саудаўскі рыял.

Літ.: Васильев А.М. История Саудовской Аравии (1975 г. — конец XX в.). 2 изд. М., 1999; Holden D., Richard G. The House of Saud. New York, 1981; Zacey R. The Kingdom: Arabia and the House of Saud. New York, 1981.

У.С.Кошалеў (гісторыя), *П.І.Рогач* (прырода, насельніцтва, гаспадарка).

Да арт. **Саудаўская Аравія**. Аўтадарога Мекка—Таіф.

САЎЛІЧ Уладзімір Уладзіміравіч (н. 1.9.1951, в. Мацясы Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.), бел. драматург. Скончыў БДУ (1973). Настаўнічаў. З 1976 у газ. «Віцебскі рабочы». Друкуецца з 1968. Аўтар п'ес «Халімон камандуе парадам» (паст. 1986), «Адзін Гаўрыла ў Полацку» (1990), «Сабака з залатым зубам» (паст. 1992, Рэсп. т-р бел. драматургіі). Піша гумарэскі.

Тв.: Халімон камандуе парадам: П'есы. Мн., 1993.

САЎР, хрыбет у Казахстане і Кітаі. Размешчаны на ПдУ ад воз. Зайсан. Даўж. 140 км, выш. да 3816 м (г. Музтаў). Складзены з вулканагенных адкладаў, сланцаў, вапнякоў, пясчанікаў, граніто-ідаў. Радовішчы вугалю і каляровых сланцаў. На паўн. схіле — сярэднягорныя лугі і лясы з сібірскай лістоўніцы, цяньшанскай елкі з дамешкамі сібірскай піхты, на паўд. схіле — стэпы, паўпустыні. На грэбені — высакагорныя лугі. Ледавікі (агульная пл. 17 км^2).

САЎГАС, савецкая гаспадарка, форма арганізацыі с.-г. вытв-сці, заснаваная на дзярж. уласнасці і сродках. У параўнанні з *калгасам* мае больш высокі ўзровень аграмаджвання — сродкі вытв-сці і прадукцыя, якую атрымліваюць С., належаць дзяржаве. Ствараецца паводле Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прадпрыемствах» (1990), Кодэкса аб зямлі і інш. заканадаўчых актаў. Дзейнічае на аснове статута прадпрыемства. На Беларусі, як і ў Расійскай Федэрацыі, С. з'явіліся з устанаўленнем сав. улады на базе канфіскаваных памешчыцкіх маёнткаў. У кан-

цы 1927 было 247 С. з агульнай пл. 103,5 тыс. га; на іх долю прыпадала 1,3% вытв-сці с.-г. прадукцыі. У 1971 у БССР былі 834 С., у т.л. 228 малочнамясных, 292 мяса-малочныя, 161 малочна-агароднінны, 63 птушкагадоўчыя, інш. спецгаспадаркі. Найбольш С. было ў 1985 — 917. У іх працавала 11,9% усіх рабочых рэспублікі, яны займалі 3337 тыс. га с.-г. угоддзяў (35%), пастаўлялі каля 40% с.-г. прадукцыі. З пераходам у канцы 1980-х г. да рынкавых адносін і шматукладнай эканомікі павялічылася роля вытворцаў недзярж. сектара і доля С. ў вытв-сці прадукцыі пачала зніжацца. За 1991—95 сяроднегадавое зніжэнне аб'ёму вытв-сці валавой прадукцыі ў С. склала 7,3%, узровень рэнтабельнасці скараціўся амаль у 5 разоў. З 1990-х г. С. пераведзены на поўны гасп. разлік, пашырана іх гасп. самастойнасць. На 1.1.2001 617 С., якія маюць 1861 тыс. га с.-г. угоддзяў. Мяркуецца, што да найб. стратных гаспадарак непазбежны радыкальныя меры — змена формаў уласнасці і гаспадарання і інш. *А.М.Сарокін.*

САЎГА́СНАЯ, вёска ў Мікалаеўскім с/с Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл., на р. Чачора. Да 1966 наз. Царкоўе. Цэнтр саўгаса. За 42 км на Пн ад горада і чыг. ст. Буда-Кашалёва, 68 км ад Гомеля. 499 ж., 179 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

САЎДЗЕ́ЛЬНІЦТВА, наўмысны сумесны ўдзел дзвюх ці больш асоб ва ўчыненні наўмыснага злачынства. Саўдзельнікамі злачынства побач з выканаўцамі прызнаюцца арганізатары, падбухторшчыкі і памагатыя. Выканаўцам прызнаецца асоба, якая арганізавала злачынства або кіравала яго ўчыненнем, або асоба, якая непасрэдна ўчыняе злачынства або непасрэдна ўдзельнічае ў ім сумесна з інш. асобамі, або ўчыняе злачынства праз выкарыстанне інш. асоб, якія не падлягаюць паводле закону крымін. адказнасці або ўчынілі злачынства па неасцярожнасці. Арганізатарам (кіраўніком) прызнаецца асоба, якая арганізавала злачынства або кіравала яго ўчыненнем, або асоба, якая стварыла арганізаваную групу (злачынную арг-цыю) ці кіравала імі. Падбухторшчыкам прызнаецца асоба, што схіляла інш. асобу да ўчынення злачынства. Памагатым прызнаецца асоба, якая садзейнічала ўчыненню злачынства парадамі, указаннямі, прадстаўленнем інфармацыі або прылад і сродкаў учынення злачынства, устараненнем перашкод або аказанненм інш. дапамогі, або асоба, якая загадзя абяцала схаваць злачынцу, сляды злачынства або прадметы, набытыя злачынным шляхам, або асоба, якая загадзя абяцала набыць ці збыць такія прадметы. Адказнасць арганізатара, падбухторшчыка і памагатага настае па тым жа арт. Асаблівай часткі Крымін. кодэкса Рэспублікі Беларусь, што і выканаўцы. За дзеянні, што ўчынены выканаўцам і не ахопліваюцца намерам саўдзельнікаў, інш. саўдзельнікі крымін. адказнасці не нясуць. Саўдзельнікі нясуць павышаную адказнасць, калі злачынства ўчынена групай асоб, якія непасрэдна ўдзельнічалі ў яго ўчыненні, або арганізаванай групай, або злачыннай арг-цыяй. *Г.А.Маслыка.*

САЎКІН Валянцін Георгіевіч (н. 20.11.1932, г. Гомель), бел. вучоны ў галіне матэрыялазнаўства. Д-р тэхн. н. (1984), праф. (1990). Скончыў Бел. ін-т інжынераў чыг. транспарту (1959). З 1963 у Ін-це механікі металапалімерных сістэм Нац. АН Беларусі. Навук. працы па структуры і фіз.-мех. уласцівасцях палімераў і кампазіцыйных матэрыялаў на іх аснове, вывучэнні трэння і зносу палімерных матэрыялаў. Распрацаваў новы навук. кірунак — структурную трыбамеханіку палімераў. Дзярж. прэмія Беларусі 1972.

Тв.: Трение полимеров. М., 1972 (у сааўт.); Трение и износ материалов на основе полимеров. Мн., 1976 (у сааўт.); Структурная трибомеханика материалов на основе полимеров (разам з А.І.Свірыдзёнкам) // Трение и износ. 1980. Т. 1, №1.

САЎМА́КА ПАЎСТА́ННЕ, паўстанне *скіфаў* у *Баспорскай дзяржаве* ў 107 да н.э., якое ўзначаліў правадыр баспорскіх скіфаў Саўмак. Пачалося ў *Пантыкапеі* (цяпер г. Керч, Украіна) у час перагавораў пантыйскага палкаводца Дыяфанта з баспорскім царом Перысадам V аб перадачы ўлады над краінай пантыйскаму цару *Мітрыдату VI Еўпатару*, што значна ўзмацніла б эксплуатацыю скіфскага насельніцтва (залежных сялян, рамеснікаў, рабоў). Саўмак забіў Перысада, а Дыяфант уцёк у Херсанес. Паўстанцы авалодалі ўсёй еўрап. ч. Баспора і Саўмак стаў царом Баспора (кіраваў каля года). Пасля працяглай падрыхтоўкі Мітрыдат VI накіраваў у Сінопу (гл. *Сінап*) карную экспедыцыю на чале з Дыяфантам, да якой у Крыме далучаны херсанескія атрады. Войскі Дыяфанта занялі Феадосію, прайшлі Керчанскі п-аў і захапілі Пантыкапей. С.п. было задушана, Саўмак трапіў у палон (пазней пакараны смерцю), а Баспорская дзяржава перайшла пад уладу Мітрыдата VI.

САЎНАРКО́М, скарочаная назва *Савета Народных Камісараў*.

САЎРАМА́ТЫ (грэч. Sauromátai), качавыя плямёны, блізкія да *скіфаў* і сакаў; жылі ў 7—4 ст. да н.э. ў паволжскіх і прыўральскіх стэпах. У грамадскім жыцці вял. ролю адыгрывалі жанчыны (правадыры, жрыцы). З канца 5 ст. і ў 4 ст. да н.э. асобныя плямёны С. пачалі цясніць скіфаў і пераходзілі р. Дон. У 4—3 ст. да н.э. ў С. склаліся новыя саюзы плямён, да якіх далучыліся роднасныя ім плямёны з У. З 3 ст. да н.э. вядомы пад агульнай назвай *сарматы*.

САЎРА́САЎ Аляксей Кандратавіч (24.5.1830, Масква — 8.10.1897), рускі жывапісец-пейзажыст. У 1844—54 вучыўся ў Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства, у 1857—82 выкладаў у ім. Чл.-заснавальнік Т-ва перасоўных маст. выставак (гл. *Перасоўнікі*). Раннім творам уласцівы рысы рамант. пейзажу («Від на Крэмль у непагадзь», 1851). У 1850—70-я г. звяртаўся да спакойных, апавядальных вобразаў, каларыстычнага адзінства, узмоцненага эмацыянальным гучаннем святлаценю («Ласіны востраў у Сакольніках», 1869; «Гракі прыляцелі», 1871). Прастатой матыву, вял. ўнутр. змястоўнасцю, цэльнасцю вызначаюцца работы «Прасёлак» (1873), «Дворык» (1870-я г.) і інш. С. зрабіў вял. ўплыў на рус. пейзажыстаў канца 19 — пач. 20 ст.

Літ.: Федоров-Давыдов А.А. Саврасов. М., 1957; Новоуспенский Н.Н. А.К.Саврасов: [Альбом]. Л., 1981; Мальцева Ф.С. А.К.Саврасов: [Альбом]. 2 изд. Л., 1989. *Л.Ф.Салавей.*

А.**Саўрасаў**. Гракі прыляцелі. 1871.

САЎТ-БЕ́НД (South Bend), горад на Пн ЗША, у штаце Індыяна. Засн. ў 1820. 99,4 тыс. ж., з г. Мішавока і агульнымі прыгарадамі каля 250 тыс. ж. (1998). Трансп. вузел. Прам-сць: аўтамаб., вытв-сць дэталей і вузлоў для самалётаў і ракет, с.-г. машын, падшыпнікаў, кавальска-прэсавага і інш. абсталявання; гумава-тэхн., металургічная, металаапрацоўчая. 2 ун-ты. Музей і маст. галерэя.

САЎТГЕ́МПТАН (Southampton), востраў каля берагоў Паўн. Амерыкі, у паўн. ч. Гудзонава зал. Тэр. Канады. Пл. 44 тыс. км². Паверхня раўнінная, выш. да 533 м. Тундра. Нас. пункт — Корал-Харбар.

САЎТГЕ́МПТАН (Southampton), горад на Пд Вялікабрытаніі. Вядомы з 10 ст. Каля 220 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог, буйны пасаж. порт у пралі-

ве Ла-Манш; у зал. Солент — нафтавы і ваен. аванпорт Каншот-Касл. Прам-сць: суднабуд., эл.-тэхн., аўтамаб., харчовая. Ун-т. Руіны саксонскіх і нарманскіх збудаванняў. Арх. помнікі 12—14 ст. Кліматычны прыморскі курорт. Паблізу буйны нафтаперапр. з-д, нафтахім. і авіябуд. прадпрыемствы.

САЎТ-УЭСТ (South West), нацыянальны парк у Аўстраліі, на ПдЗ в-ва Тасманія. Засн. ў 1968. Пл. 442,2 тыс. га. Размешчаны на выш. да 1250 м. Лясы з паўд. буку, эўкаліптаў, вял. ўчасткі пустак. Рэдкія віды арнітафауны (земляны папугай і інш.). Біясферны рэзерват. Турызм.

САЎТЭНД-ОН-СІ (Southend-on-Sea), горад у Вялікабрытаніі, на У ад Лондана, у эстуарыі Тэмзы. Каля 180 тыс. ж. (2000). Марскі порт. Прам-сць: эл.-тэхн., вытв-сць металавырабаў і пластмас; паліграф., швейная, абутковая, мэблевая. Кліматычны прыморскі курорт. Традыц. спаборніцтвы яхтсменаў.

САЎЦІ (Southey) Роберт (12.8.1774, г. Брысталь, Вялікабрытанія — 21.3.1843), англійскі паэт-рамантык; прадстаўнік «азёрнай школы». Вучыўся ў Оксфардскім ун-це (1792—94), дзе зблізіўся з С.Т.*Колрыджам*. Паэт. творчасць пачаў з жанру нар. балады. Аўтар вершаванай драмы «Уот Тайлер» (1794, апубл. 1817) і паэмы «Жанна д'Арк» (1796), напісаных пад уплывам франц. рэвалюцыі 1789—93. Вядомасць прынеслі рамант. балады «Бленгеймскі бой» (1798) і «Суд божы над епіскапам» (1799). У паэмах на фантаст. сюжэты «Талаба-разбуральнік» (1801), «Мэдак» (1805), «Родэрык, апошні з готаў» (1814) выявілася эвалюцыя С. ад бунтарскіх настрояў да захаплення фальклорам і містыкай, да рэліг. пакорлівасці. Аўтар наратыўнай паэмы «Праклятце Кехамы» (1810), біягр. працы «Жыццё Нельсана» (1813), кніг па гісторыі, эсэ.

Тв.: Рус. пер. — Баллады. Пг., 1922.

Літ.: Дьяконова Н.Я. Китс и его современники. М., 1973. *М.С.Рагачэўская.*

САЎЧАНКА Аляксандр Мікалаевіч (н. 6.8.1949, г. Гродна), бел. вучоны ў галіне кардыяхірургіі. Д-р мед. н. (1982), праф. (1986). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1972). У 1979—93 у Бел. НДІ кардыялогіі (заг. лабараторыі, з 1981 заг. аддзела, з 1988 нам. дырэктара). Навук. працы па пытаннях сардэчна-сасудзістай хірургіі, ішэмічнай хваробы сэрца, хірург. лячэнні набытых заган сэрца, устаноўцы штучных кардыястымулятараў. З 1993 жыве за мяжой.

Тв.: Заболевания артерий и вен конечностей (разам з І.М.Грышыным) // Справочник хирурга. Мн., 1980; Клиническая ангиология и ангиохирургия. Ч. 1—2. Мн., 1980—81 (з ім жа).

САЎЧАНКА Аркадзь Маркавіч (н. 6.4.1936, г. Віцебск), бел. спявак (барытон). Нар. арт. Беларусі (1976). Нар. арт. СССР (1985). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1960). З 1960 саліст Нац. акад. т-ра оперы Беларусі. Валодае мяккім лірычным голасам своеасаблівага прыгожага тэмбру, шырокага дыяпазону, высокай вак. тэхнікай, майстэрствам сцэн. пераўвасаблення. Яму ўласціва ўдумлівая адпрацоўка, філігранная шліфоўка дэталей вак. і сцэнічнага бакоў ролі. Сярод партый нац. рэпертуару: Апанас і Фон Шолен («Алеся» Я.Цікоцкага), Лагоўскі («Яснае світанне» А.Туранкова), Лявон Бурак,

Аркадзь Маркавіч **Саўчанка**.

Максім Багдановіч, Міхал («Калючая ружа», «Зорка Венера», «Новая зямля» Ю.Семянякі), Кізгайла («Сівая легенда» Дз.Смольскага), Ляўчук («Сцежкаю жыцця» Г.Вагнера), Фаскары, Бургамістр («Джардана Бруна», «Візіт дамы» С.Картэса), Понцій Пілат («Майстар і Маргарыта» Я.Глебава); класічных і сучасных опер: Анегін, Ялецкі, Томскі («Яўген Анегін», «Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Мізгір («Снягурачка» М.Рымскага-Корсакава), Януш («Галька» С.Манюшкі), Фігара («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Марсель, Шарплес («Багема», «Чыо-Чыо-сан» Дж.Пучыні), Валянцін («Фауст» Ш.Гуно), Эскамільё, Зурга («Кармэн», «Шукальнікі жэмчугу» Ж.Бізэ), Дон Жуан, граф Альмавіва («Дон Жуан», «Вяселле Фігара» В.А.Моцарта), Рыгалета, граф ды Луна, Радрыга, Жэрмон, Рэната («Рыгалета», «Трубадур», «Дон Карлас», «Травіята», «Баль-маскарад» Дж.Вердзі), Тэльрамунд («Лаэнгрын» Р.Вагнера), Малатэста («Дон Паскуале» Г.Даніцэці), Лістрат («У буру» Ц.Хрэннікава), Камісар («Брэсцкая крэпасць» К.Малчанава), Фердынанд, Андрэй Балконскі («Заручыны ў манастыры», «Вайна і мір» С.Пракоф'ева). Выканаў партыі Адама ў тэлеоперы «Ранак» Вагнера, Яўхіма ў радыёоперы «Барвовы золак» К.Цесакова, Скарыны ў фільме-оперы «Францыск Скарына» Дз.Смольскага. У канцэртным рэпертуары арыі з класічных і сучасных опер, рамансы, творы бел. кампазітараў, бел., рус. і ўкр. нар. песні. *А.Я.Ракава.*

САЎЧАНКА Емяльян Рыгоравіч (18.8.1899, г. Верхнядзвінск Віцебскай вобл. — 1.5.1966), генерал-маёр (1943). Скончыў ваен. акадэміі імя Фрунзе (1933) і Генштаба (1941). У Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік грамадз. вайны, баёў на Зах. фронце і па ліквідацыі фарміраванняў Махно і Пятлюры. У Вял. Айч. вайну на Ленінградскім фронце: нач. штаба, нам. камандзіра стралк. корпуса, нач. штаба арміі, нам. нач. тылу Войска Польскага; удзельнік абароны і прарыву блакады Ленінграда, Вісла-Одэрскай і інш. аперацый. У 1947—53 на выкладчыцкай рабоце ў Ваен. акадэміі.

САЎЧАНКА Мікалай Емяльянавіч (н. 7.10.1936, в. Турышчавічы Чачэрскага р-на Гомельскай вобл.), бел. фізік і педагог. Дац. (1990). Скончыў Гомельскі пед. ін-т (1958). З 1967 у Бел. ун-це транспарту. Навук. працы па праблемах выкладання фізікі, пытаннях пераемнасці навучання ў школах і ВНУ. Аўтар навуч. дапаможнікаў для школ і падрыхтоўчых аддз. ВНУ.

Тв.: Ошибки на вступительных экзаменах по физике: Справ. пособие. 2 изд. Мн, 1992; Решение задач по физике. 3 изд. Мн, 1999; Физика в вопросах и задачах. Мн., 2000; Задачи по физике с анализом их решения. 2 изд. М., 2000.

А.Саўчанка ў ролі Радрыга.

САЎЧАНКА Мікалай Яўсеевіч (7.11.1922, пас. Чырвоны Дварэц Чачэрскага р-на Гомельскай вобл. — 12.6.2001), бел. вучоны ў галіне уралогіі, дзярж. дзеяч. Акад. Нац. АН Беларусі (1972, чл.-кар. 1969), д-р мед. н. (1965), праф. (1966). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1948). З 1958 у Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў (з 1960 рэктар). У 1966—86 міністр аховы здароўя Беларусі, адначасова з 1967 у Мінскім мед. ін-це (заг. кафедры), з 1970 кіраўнік Бел. цэнтра перасадкі ныр-

М.Я.Саўчанка.

У.К.Саўчанка.

рак. Навук. працы па пытаннях хвароб мочапалавой сістэмы, нырачнай гіпертаніі, трансплантацыі органаў і тканак, аўтаматызаваных сістэм кіравання аховай здароўя. Распрацаваў і ўкараніў у клінічную практыку метады дыягностыкі і арыгінальныя рэканструктыўныя органазахавальныя аперацыі для лячэння хворых з прыроджанымі заганамі развіцця нырак і мачавых шляхоў, метады лячэння злаякасных пухлін з выкарыстаннем гіпертэрміі і гіперглікеміі. Дзярж. прэміі Беларусі 1982, 1988.

Тв.: Нейрогенные расстройства мочеиспускания. Мн., 1970 (разам В.А.Мохартам); Клиническая реография. Киев, 1977 (у сааўт.); Урология для семейного врача: Справ. пособие. Мн., 1991.

САЎЧАНКА Сцяпан Уладзіміравіч (28.12.1889, с. Сіняўка Менскага р-на Чарнігаўскай вобл., Украіна — 16.1.1942), украінскі літаратуразнавец і педагог. Праф. (1925). Скончыў Кіеўскі ун-т (1913) і з 1917 выкладаў у ім. Аўтар даследаванняў: «Паходжанне раманскіх моў» (1916), «Гі дэ Мапасан» (1926), «Класічны тэатр XVII ст. і класіцызм» (1931), «Шаўчэнка і сусветная літаратура» (1939) і інш. У працы «Руская народная казка» (1914) даследаваў гісторыю збірання і вывучэння бел. казак. Пераклаў з лац. на рус. мову і апублікаваў «Данясенні папскага нунцыя Іаана Тарэса, архіепіскапа Адрыянопальскага, аб падзеях у Польшчы ў час, паўстання Багдана Хмяльніцкага» (1916), што мела пэўнае значэнне для вывучэння гісторыі Беларусі. *В.Я.Буран.*

САЎЧАНКА Уладзімір Кірылавіч (н. 27.9.1939, в. Хмяльное Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне генетыкі. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1989), д-р біял. н. (1977), праф. (1988). Скончыў Бел. тэхнал. ін-т (1962). У 1965—90 у Ін-це генетыкі і цыталогіі АН Беларусі (у 1979—90 заг. лабараторыі). У 1980—90 старшыня Бел. нац. к-та па праграме ЮНЕСКА «Чалавек і біясфера», з 1990 нам. дырэктара Аддзела экалагічных навук ЮНЕСКА. Навук. працы па агульнай і тэарэт. генетыцы. Распрацаваў новыя метады генет. аналізу і сінтэзу, асн. палажэнні генетыкі паліплоідных папуляцый, выявіў генет. прычыны геномнага эфекту, тэарэтычна абгрунтаваў і эксперыментальна распрацаваў канцэпцыю геномнай лабільнасці бісексуальных жывёл і асацыятыўнага адбору, вывучыў генет. працэсы ў папуляцыі пры працяглым адборы. Распрацаваў сістэмную мадэль самаарганізацыі эвалюц. працэсу, сістэму генет. маніторынгу папуляцый, прапанаваў спосаб сеткавых пробных скрыжаванняў. Дзярж. прэмія Беларусі 1984.

Тв.: Генетика полиплоидных популяций. Мн., 1976; Генетический анализ и синтез в практической селекции. Мн., 1986; Длительный отбор в популяциях. Мн., 1988 (разам з М.У.Тананка, Б.Ю.Аношанкам).

САФАНІЯ, Сафанія-Хафджы, газанафтавае радовішча ў паўд.-зах. часткі Персідскага зал., у тэр. водах Саудаўскай Аравіі і зоны, падзеленай паміж Саудаўскай Аравіяй і Кувейтам; самае вял. марское газанафтавае радовішча ў свеце. Уваходзіць у *Персідскага заліва нафтагазаносны басейн.* Адкрыта ў 1951, распрацоўваецца з 1957. Пач. прамысл. запасы нафты 3,45 млрд. т, газу 3,27 млрд. м^3. Паклады нафты ў пародах мелавога ўзросту на глыб. 1500—3360 м. Паклады газу ў вапняках палеагенавага (зацэнавага) узросту на глыб. 600—900 м. Шчыльн. нафты 0,87—0,89 г/см^3, мае серу (2—3%). Цэнтр здабычы — нас. пункт Сафанія.

САФА́РАЎ Назір (9.1.1905, г. Джызак, Узбекістан — 1.4.1985), узбекскі пісьменнік. Засл. дз. маст. Узбекістана (1950). Нар. пісьменнік Узбекістана (1975). Друкаваўся з 1926. Аўтар зб-каў апавяд. і нарысаў «Землякі» (1958), «Залаты месяц» (1961), «Кропля крыві» (1967), аповесцей «Празорлівая дзяўчына» (1961), «Аб пражытым і перажытым» (1968, Дзярж. прэмія Узбекістана 1968), рамана «Наўруз» («Час белых буслоў», 1973) і інш., п'ес «Абуджэнне» (1938), «Золак Усходу» (1948), драмы «Школа жыцця» (1954), камедыі «Каму гора, каму смех» (1963) і інш. Адзін з аўтараў сцэнарыя фільма «Бура над Азіяй» (1965). На бел. мову раман «Дні праклёну і дні надзеі» (1982) пераклаў А.Жук.

САФА́РЫ (англ. safari ад араб. сафара — падарожнік), 1) запаведнік у Афрыцы, у якім дазволена паляванне на дзікіх звяроў, а таксама само паляванне ў гэтым запаведніку. 2) Адзенне прамога крою з лёгкай гладкай тканіны з кішэнямі і адстрочкай.

САФАРЭ́ВІЧ (Safarewicz) Ян (26.1.1904, г. Даўгаўпілс, Латвія — 1992), польскі моваznавец. Чл. Польскай АН у Кракаве (з 1945), Польскай АН (з 1958). Вучыўся ў Вільні і Парыжы. З 1937 праф. Ягелонскага ун-та ў Кракаве. Аўтар прац па гісторыі лац. мовы, класічных і балт. мовах, індаеўрапеістыцы, агульным моваznаўстве: «Даследаванні па фанетыцы і метрыцы лацінскай мовы» (1936), «Гістарычная граматыка лацінскай мовы» (ч. 1—2, 1937—50, з Я.Атрэмбскім), «Нарыс гістарычнай граматыкі лацінскай мовы» (1953), «Нарыс гісторыі лацінскай мовы» (1986). Большасць артыкулаў сабрана ў зб. «Моваznаўчыя даследаванні» (1967). *А.Я.Міхневіч.*

САФІ́, Асфі, горад на З Марока. Адм. ц. аднайм. правінцыі. Засн. ў 11 ст. Каля 250 тыс. ж. (2000). Порт на ўзбярэжжы Атлантычнага ак. (вываз фасфарытаў, суперфасфату, рыбных кансерваў). Пачатковы пункт чыгункі ва ўнутр. частцы краіны. Найбуйнейшы сусв. цэнтр па вытв-сці фосфарнай кіслаты. Прам-сць: суднабуд., рыбакансервавая, тэкстыльная. Цэнтр рыбалоўства.

САФІ́ЗМ (грэч. sophisma выдумка, галаваломка), лагічна няправільнае, уяўнае меркаванне (вывад, доказ), якое выдаецца за правільнае. Звычайна абгрунтоўвае заведама абсурднае ці парадаксальнае сцвярджэнне, якое супярэчыць агульнапрынятым уяўленням. Грунтуецца на наўмысных лагічных памылках (падмена тэзіса доказу, парушэнне правіл лагічнага вываду, прыняцце несапраўдных пасылак), мнагазначнасці слоў, аманіміі і інш. Класічным узорам С. з'яўляецца сцвярджэнне: «Тое, што ты не страціў, ты маеш; ты не страціў рогі, значыць, ты іх маеш». Шматлікія ўзоры С. прыводзіў у сваіх дыялогах Платон («Эўтыдэм» і інш.). Лагічны аналіз С. і іх класіфікацыю зрабіў Арыстоцель у працы «Аб сафістычных абвяржэннях». Сенека параўноўваў выкарыстанне С. з мастацтвам фокусніка. Г.Гегель лічыў, што С. не толькі выконвае функцыю ўвядзення ў зман, але і з'яўляецца своеасаблівай формай усведамлення праблемнай сітуацыі. Адрозніваюць 3 асн. віды С.: *сцвярджэнне тэрміна* — сілагістычнае розумазаключэнне, у якім парушаецца правіла простага катэгарычнага *сілагізму* аб тым, што ў сілагізме выкарыстоўваюцца толькі 3 тэрміны; меркаванне будуецца з выкарыстаннем падобных, але не тоесных паняццяў (напр., «Злодзей не жадае набыць нічога кепскага; набыццё добрага ёсць справа добрая; значыць, злодзей жадае добрага»); *недазволенага працэсу* — сілагістычнае розумазаключэнне, у якім парушаецца правіла аб тым, што тэрміны, не ўзятыя ў пасылках ва ўсім аб'ёме, не могуць быць узяты ва ўсім аб'ёме і ў заключэнні (напр., «Усе ўважлівыя добра засвойваюць урокі; некат. вучні ўважлівыя; усе вучні добра засвойваюць урокі»); *зборнага сярэдняга тэрміна* — сілагістычнае розума-

заключэнне, у якім парушаецца правіла аб тым, што сярэдні тэрмін (агульны для абедзвюх пасылак) павінен быць узяты ва ўсім аб'ёме хаця б у адной з пасылак (напр., «Некат. людзі ўмеюць іграць на скрыпцы; усе дыпламаты — людзі; усе дыпламаты ўмеюць іграць на скрыпцы»). *А.Б.Савеня.*

САФІ́СТЫ (грэч. sophistēs мудрэц, майстар), умоўнае абазначэнне шэрагу стараж.-грэч. філосафаў сярэдзіны 5 — 1-й пал. 4 ст. да н.э. Першапачаткова С. называлі мудрых людзей, дасведчаных і аўтарытэтных у пытаннях прыватнага і грамадскага жыцця. З сярэдзіны 5 ст. да н.э. С. сталі называць платных выкладчыкаў красамоўства і разнастайных ведаў, якія актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці. С. былі практыкамі і тэарэтыкамі *рыторыкі*. У цэнтры іх увагі было слова. Яны ўпершыню заўважылі, што мова — семантычна адкрытая сістэма, якая характарызуецца зараджэннем новых і стратай устарэлых сэнсаў слова. Адрозніваюць старэйшых (Пратагор, Горгій, Гіпій, Антыфонт, Крытый) і малодшых С. (Лікафрон, Алкідамант, Трасімах). С. не былі адзінай, цэласнай групай ні па сац.-паліт. арыентацыі, ні па філас. ідэях. Агульнае, што аб'ядноўвае іх, — перанос увагі з натурфіласофіі на праблемы чалавека, яго суб'ектыўных здольнасцей, этыкі, палітыкі і тэорыі пазнання. Характэрная рыса вучэнняў С. — *рэлятывізм*, які знайшоў класічнае выяўленне ў тэзісе Пратагора «Чалавек — мера ўсіх рэчаў». С. лічылі, што не існуе надзейных аб'ектыўных крытэрыяў для адрознення ісціны ад маны, дабра ад зла, справядлівасці ад несправядлівасці. Рэлятывізму С. садзейнічаў характар іх дзейнасці: гал. задачай яны лічылі навучыць чалавека пераканаўча абараняць любую ідэю, якая б магла спатрэбіцца для паспяховага ўладкавання спраў. Вучэнні С. супярэчылі традыц. рэліг. вераванням: напр., Пратагор сцвярджаў, што не ведае, ці існуюць багі; Крытый абвяшчаў рэлігію выдумкай, прызначанай для таго, каб прымушаць простых людзей падпарадкоўвацца законам. Шэраг С. прапаведавалі ідэі роўнасці людзей перад богам і прыродай і абвяргалі прывілеі знаці (Алкідамант, Антыфонт, Лікафрон). *А.Б.Савеня.*

САФІ́СТЫКА, 1) кірунак у стараж.-грэч. філасофіі, створаны *сафістамі* ў сярэдзіне 5 ст. да н.э. 2) Абгрунтаванне пэўных сцвярджэнняў пры дапамозе меркаванняў (вывадаў, доказаў), фармальна правільных, а па змесце несапраўдных (гл. *Сафізм*). Вызначаецца абсалютызацыяй адноснасці і супярэчлівасці працэсу пазнання. Арыстоцель лічыў С. ўяўнай, а не сапраўднай мудрасцю. Сафістычныя пабудовы характарызуюцца наўмысным выкарыстаннем лагічных памылак (падмена паняццяў, ужыванне мнагазначных тэрмінаў) з мэтай увядзення ў зман. С. з'яўляецца вынікам свядомага некарэктнага выкарыстання лагічных і семантычных правіл і аперацый і прыводзіць да страты мысленнем канкрэтнасці, акрэсленасці і суб'ектыўнага ўжывання «гібкасці паняццяў». *А.Б.Савеня.*

САФІ́Я, горад, сталіца Балгарыі. Знаходзіцца на З краіны, у Сафійскай катлавіне, каля падножжа гор Віташа і Люлін. Адм. ц. Сафійскай вобл.; з гарадамі Банкя, Нові-Іскыр і інш. ўтварае самаст. адм. адзінку — Вял. Сафію. 1192 тыс. ж. (1996). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Гал. эканам., навук. і культ. цэнтр краіны. У С. сканцэнтравана каля 1/6 агульнабалгарскай прамысл. вытв-сці. Прам-сць: маш.-буд. (у т.л. эл.-тэхн. і радыёэлектронная, станка- і прыладабудаўнічая, вытв-сць пад'ёмна-трансп. абсталявання); каляровая і чорная металургія, хім., гумавая, цэлюлозна-папяровая, паліграф., харчасмакавая, лёгкая. Ун-т. Кансерваторыя. АН і НДІ; бібліятэкі. Музеі: Нац. маст. галерэя, Нар. археалагічны, этнагр., гісторыі С. і інш. Тэатры. Філармонія.

Сафія. Плошча Народнага сходу.

Засн. ў 1 ст. рымлянамі на месцы б. фракійскага паселішча пад назвай Сердзіка. У 3 ст. гал. горад (наз. Ульпія-Сердзіка) рым. правінцыі Дакія, потым адзін з гандл. цэнтраў Візант. імперыі. У 447 разбурана гунамі. Адноўлена пры Юсцініяне [527—565]. З 809 у складзе Першага (681—1018) і Другога (1187—1396) балг. царстваў пад назвай Срэдзец. У 1018—1194 пад уладай Візантыі. У 1078 у горадзе адбылося антывізант. паўстанне. У 1194 вызвалена ад візант. панавання. З канца 14 ст. наз. С. ад гал. царквы св. Сафіі. У 1382 захоплена туркамі, тут размяшчалася рэзідэнцыя румелійскага бейлербея. У 16—18 ст. С. — буйнейшы (пасля Канстанцінопаля) гандл.-рамесніцкі і культ. цэнтр Балканскага п-ва. У канцы 18 — пач. 19 ст. адзін з цэнтраў балг. нац.-вызв. руху. У 1878 вызвалены ад тур. панавання рус. войскамі. З 1879 сталіца Балгарыі. С. — адзін з цэнтраў *Вераснёўскага народнага ўзброенага паўстання 1944.*

Ад рым. часу захаваліся рэшткі крапасной сцяны, пабудова нявызначанага прызначэння (перабудавана ў 3—4 ст. у царкву св. Георгія, размалёўкі 12—14 ст.). У 6 ст. ўзведзена царква св. Сафіі, якая дала назву гораду. З канца 14 ст. С. развівалася ва ўсх. стылі (тур. мячэць Баня-пашы, 1576, і інш.). Інтэнсіўнае буд-ва пачалося ў канцы 19 ст. Планіроўка радыяльна-кальцавая (у цэнтры) і прамавугольная. У стылях мадэрн і неавізант. створаны пабудовы гар. цэнтра: храм-помнік Аляксандра Неўскага (1904—12, арх. А.Памяранцаў), Нар. т-р імя І.Вазава (1907, арх. Ф.Фельнер, Г.Гельмер), мінер. лазні (1907—10, арх. П.Момчылаў). Сярод помнікаў канструктывізму і неакласіцызму: атэль і канцэртная зала «Балгарыя» (1937, арх. С. Бялкоўскі, І.Данчаў), Балг. нац. банк (1938, арх. І.Васільёў, Дз. Цолаў). Паводле генпланаў 1945 і 1961 узведзены Дзярж. б-ка імя В.Каларава (1946—53), ансамбль цэнтра з сістэмай плошчаў, неакласіцыстычнымі будынкамі і маўзалеем Г.Дзімітрова (1949, арх. Г.Аўчараў, Р.Рыбараў), стадыён імя В.Леўскага (1953), спарт. комплекс «Універсіяда» (1961), Палац культуры «Сафія» (1981, арх. А.Бараў). Створаны свабодныя па планіроўцы жылыя раёны (Зах. парк, комплексы Усход, Іпадром, мікрараён імя Мілева і інш.). Помнікі: Вызваліцелям (1907, скульпт. А.Цокі), Манумент у гонар Сав. Арміі (1954, арх. Д.Мітаў, Л.Нейкаў, скульпт. І.Фунеў і інш.). *Я.Ф.Шунейка* (архітэктура).

САФЛО́Р (Carthamus), род кветкавых раслін сям. складанакветных. 19 відаў. Пашыраны ў Міжземнамор'і, Пярэдняй і Сярэдняй Азіі. У Еўразіі, Цэнтр. і Паўд. Амерыцы, Аўстраліі вырошчваюць С. фарбавальны (C.tinotorius) — стараж. культуру, вядомую ў Егіпце з 16 ст. да н.э. (выкарыстоўвалі для афарбоўкі павязак для мумій). На Беларусі інтрадукаваны ў Цэнтр. бат. садзе Нац. АН. Каля жылля, уздоўж дарог як заносны трапляецца С. шарсцісты (C. lanatus).

С. фарбавальны — аднагадовая травяністая расліна выш. да 100 см. Сцёблы галінастыя, цвёрдыя, белаватыя. Лісце сядзячае, скурыстае, з шыпамі па краі. Кветкі трубчастыя, дробныя, жоўтыя, аранжавыя, у кошыках. Плод — сямянка. Насенне мае да 60% алею (блізкі да сланечнікавага), з кветак атрымліваюць чырв. і жоўтую фарбу. Алейная, кармавая, фарбавальная расліна. *А.М.Скуратовіч.*

САФО́КЛ (Sophoklēs; каля 496 да н.э., Калон, каля Афін — 406 да н.э.), старажытнагрэчаскі драматург. Займаў важныя дзярж. пасады, прымыкаў да групоўкі *Перыкла*. Паводле ант. крыніц, аўтар 123 драм. твораў (каля 90 трагедый і каля 25 сатыраўскіх драм). Перамагаў у шматлікіх (да 24) спаборніцтвах трагічных паэтаў. Цалкам зберагліся 7 трагедый: «Аякс» (да 422), «Антыгона» (каля 441), «Трахінянкі», «Эдып-цар» (каля 425), «Электра», «Філактэт» (паст. 409), «Эдып у Калоне» (паст. 401); часткова—сатыраўская драма «Следапыты» (апубл. 1912) і каля 1100 фрагментаў інш. твораў. Тэматыка твораў С. засн. на вядомых цыклах стараж.-грэч. міфаў: траянскага, фіванскага, міфаў пра атрыдаў і Геракла. У трагедыях дамінуе герой, які ў поўнай меры адказвае за свае паводзіны; канфлікт трагедый вынікае з яго характару, прынятых ім рашэнняў і зробленых учынкаў; ход падзей залежыць ад гэтага, а не ад знешніх абставін. У пакутах герояў С. бачыў не толькі здзяйсненне боскай кары, але і крыніцу маральнага ачышчэння, верыў у магчымасць боскай справядлівасці. С. — рэфарматар стараж.-грэч. трагедыі: увёў на сцэну трэцяга акцёра, павялічыў склад хору (ад 12 да 15), узмацніў у ім ролю *карыфея*. Трагедыі С. (найперш «Эдып-цар» і «Антыгона») і сёння ўваходзяць у рэпертуар т-раў свету. На бел. мову яго трагедыі пераклаў Ю.Дрэйзін.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Эсхіл. Прыкуты Праметэй; Сафокл. Антыгона. Мн., 1993; Рус. пер. — Трагедии. М., 1988; Драмы. М., 1990.
Л.П.Баршчэўскі.

САФО́НАЎ Васіль Ільіч (25.1.1852, станіца Іцюрская Стаўрапольскага краю, Расія — 27.11.1918), рускі піяніст, педагог, дырыжор, муз.-грамадскі дзеяч. Скончыў Пецярбургскую кансерваторыю. З 1880 выкладаў у Пецярбургскай, з 1885 у Маскоўскай (праф., у 1889—1905 дырэктар) кансерваторыях. З 1889 дырыжор сімф. аркестра Маскоўскага аддз. муз. т-ва. У 1906—09 гал. дырыжор Нью-Йоркскага філарманічнага аркестра і дырэктар Нац. кансерваторыі ў Нью-Йорку. Як піяніст вылучаўся высокай культурай, выразнай тэхнікай і тонкасцю маст. інтэрпрэтацыі. У пед. практыцы звярнуў увагу на развіццё муз. мыслення, майстэрства гукаатрымання, удасканаленне фп. тэхнікі. Аўтар метадычнай працы «Новая формула» (1915). Значны ўклад яго ў развіццё рус. піяністычнай школы. Сярод вучняў А.Скрабін, М.Метнер, А.Гнесіна, А.Гедыке, бел. піяністка-педагог В.Сямашка.
В.П.Пракапцова.

Сафокл.

А.У.Сафронаў.

САФО́НАЎ Міхаіл Фролавіч (13.1.1925, в. Шастакі Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл. — 17.7.1996), поўны кавалер ордэна Славы. У Вял. Айч. вайну з 1943 у партыз. атрадзе на Магілёўшчыне, з 1944 на фронце. Разведчык радавы С. вызначыўся ў 1944 пры захопе «языка» (Польшча) і ў 1945 у баях на тэр. Германіі. Пасля вайны да 1985 на гасп. рабоце.

САФО́РА (Sophora), род кветкавых раслін сям. бабовых. Каля 50 відаў. Пашыраны ў тропіках і субтропіках, радзей ва ўмераных шыротах. На Беларусі інтрадукавана С. японская (S.japonica).

Дрэвы, кусты, часам шматгадовыя травы. Лісце непарнаперыстаскладанае, чаргаванае. Кветкі белыя, жаўтаватыя, ружовыя, фіялетавыя, у гронках або мяцёлках. Плод — боб. Усе віды ядавітыя. Лек., дэкар., фарбавальныя, меданосныя расліны. *А.М.Скуратовіч.*

Сафлор.

Сафора таўстаплодная.

САФРАНІ́ЦКІ Уладзімір Уладзіміравіч (25.4.1901, С.-Пецярбург — 29.8.1961), рускі піяніст і педагог. Засл. дз. мастацтваў Расіі (1942). Скончыў Петраградскую кансерваторыю (1921, кл. Л.Нікалаева). З 1936 праф. Ленінградскай, з 1942 — Маскоўскай кансерваторый. Выкананне вызначалася непаўторнай інтэрпрэтацыяй, рамант. узвышанасцю, бліскучай тэхнікай, інтанацыйным і вобразным багаццем. У рэпертуары класічныя і рамант. фп. творы, у т.л. Ф.Шапэна, Ф.Ліста, Р.Шумана, А.Скрабіна. Сярод вучняў бел. піяніст-педагог Р.*Шаршэўскі*. Дзярж. прэмія СССР 1943. *В.П.Пракапцова.*

САФРО́НАЎ Анатоль Уладзіміравіч (19.1.1911, Мінск — 10.10.1990), рускі пісьменнік. Герой Сац. Працы (1981). Скончыў Растоўскі пед. ін-т (1937). У 1948—53 сакратар Саюза пісьменнікаў СССР. У 1953—86 гал. рэдактар час. «Огонек». Друкаваўся з 1929. У паэт. зб-ках «Сонечныя дні» (1934), «Марш пераможцаў» (1947), «Нішто не забываецца...» (1971), «Лірыка» (1982), паэмах «Вяселле» (1935), «Залаты бераг» (1945), «Паэма часу» (1970), «Бессмяротнасць» (1973) і інш. любоў да роднай зямлі, апяванне яе прыроды, тэма кахання. У п'есах «У адным горадзе» (паст. 1947, Дзярж. прэмія СССР 1947), «Маскоўскі характар» (1948, Дзярж. прэмія СССР 1949), «Мільён за ўсмешку» (1959), «Беражыце жывых сыноў» (1963), «Паўліна» (1965), «Зямное прыцягненне» (1978), «Катаракта» (1982) маральна-этычная праблематыка. Аўтар рамана ў вершах «У глыб часоў» (ч. 1—6, 1978—83), п'ес-памфлетаў «Гібель багоў» (1961), «Лабірынт» (1968), кн. нарысаў «Замежныя сустрэчы» (1952), «Дарогі» (1972), «На землях Азіі і Афрыкі» (1973), нарысаў і ўспамінаў «Час развітанняў і сустрэч» (1977), тэкстаў песень («Шумеў сурова бранскі лес», «Ад Волгі да Дона» і інш.), апавяданняў, публіцыст. артыкулаў, перакладаў і інш. П'есы С. ставіліся ў т-рах Беларусі: у Бел. т-ры імя Я.Купалы — «Маскоўскі характар» (1948), «Мільён за ўсмешку» (1960); у Дзярж. рус. драм. т-ры — «У адным горадзе» (1949), «Беражыце жывых сыноў» (1963); у Гродзенскім абл. драм. т-ры — «Маскоўскі характар» (1948), «Сэрца не даруе» (1955); у Брэсцкім абл. драм. т-ры — «Маскоўскі характар» (1949), «Інакш жыць нельга» (1952). Асобныя яго вершы на бел. мову пераклалі А.Звонак, П.Панчанка, У.Шахавец.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—5. М., 1971—72; Океания: Избр. М., 1980; Пока живешь и сердце бьется...: Стихи и поэмы. Мн., 1981; На трех континентах: Путешествия. Встречи. Воспоминания. М., 1986.

Літ.: Толченова Н.П. Веление времени: Очерк творчества А.Софронова. М., 1972; Зубков Ю.А. На сквозном ветру: Драматургия А.Софронова. М., 1985.

САФРО́НІЙ УРАЧА́НСКІ (свецкае Стойка Уладзіславаў; 1739, г. Коцел, Балгарыя — 22 ці 23.9.1813), балгарскі царк. дзеяч, пісьменнік і асветнік. З 1762 святар у г. Коцел, з 1794 епіскап у г. Враца (адсюль празванне Урачанскі). Ратуючыся ад тэрору турэцкіх ваен.-рабаўнічых атрадаў кірджаліяў, у 1803 эмігрыраваў у Бухарэст. У зб. «Штодзённік» (1806, першая друкаваная кніга новабалг. л-ры) і інш. творах выступаў супраць засілля грэч. духавенства, за асвету балг. народа, зрабіў важны крок у развіцці балг. літ. мовы.

Тв.: Рус. пер. — Жизнеописание. Л., 1976.

САХА́, традыцыйная ворная прылада. Выкарыстоўвалася ў лясной паласе Усх. Еўропы, Урала, Сібіры. На Беларусі С. з жалезным сашніком вядома з канца 1-га тыс. Паводле канструкцыі вылучаюць С.: палескую (літоўскую, падляшскую), віцебскую (рускую, перакладку), падняпроўскую (магілёўскую або беларускую). На ПдЗ Беларусі была пашырана палеская С., якая складалася з корпуса (рагача) са ствала дрэва, выкапанага з коранем, і рабочай часткі (расохі, плахі). Яна рабілася найчасцей з бярозы і мела раздвоены канец, на які набівалі жалезныя сашнікі. Была асіметрычнай: розная форма і пастаноўка сашнікоў і адвальных дошак (паліцы). Падобнага тыпу С. вядома і на Укр. Палессі, польскім Падляшшы, літ. Аўкштайціі. У Панямонні сустракалася С. больш лёгкая, з дзвюма паліцамі і аднолькавымі сашнікамі. Замест дышля яна мела кароткі градыль, да якога прыстасоўвалі аглоблі для коннай запрэжкі. У Паазер'і шырока выкарыстоўвалі С. віцебскага тыпу з перакладной паліцай для коннай запрэжкі з аглоблямі. На Падняпроўі выкарыстоўвалася С. з больш доўгай і стацыянарнай паліцай, замацаванай пад левы сашнік. Конь запрагаўся ў пастронкі, што мацаваліся да канца аглабель. Даўжынёй пастронка рэгулявалася глыбіня ворыва. На Палессі бытавала і С. без паліц. У Цэнтр. Беларусі сустракалася і С. з адной паліцай. У 19 ст. ў Барысаўскім і Ігуменскім пав. на сугліністых глебах выкарыстоўвалі С. палескага тыпу (паўзуха), на пясчаных завалуненых і лясных глебах — лёгкую С. колавага тыпу, т.зв. дрынду, з вузкімі трубчастымі сашнікамі і амаль вертыкальна пастаўленай расохай. Такія С., відаць, былі пашыраны ў эпоху сярэдневякоўя, пра што ўскосна сведчаць знаходкі трубчастых сашнікоў у стараж. слаях (11—13 ст.) Полацка, Мінска, Друцка. У 19 ст. колавая С. без паліцы выкарыстоўвалася пры першым узворванні папару, а пры ворыве пад сяўбу — С. з шырокімі сашнікамі і адвальным прыстасаваннем. С. без паліц выкарыстоўваюць пры акучванні бульбы і ў наш час у паўн. Беларусі. *В.С.Цітоў.*

Палеская **саха**.

САХА́, адзінка падатковага абкладання на Русі 13—15 ст. і ў Рас. дзяржаве 16—17 ст., з якой збіраўся дзярж. пазямельны падатак — *пасошнае*. Да сярэдзіны 16 ст. вымяралася колькасцю рабочай сілы. У 13—15 ст. С. складалі 2—3 селяніны-работнікі. Пры зборы падаткаў да адной С. прыраўноўвалі таксама 1 гарбарскі чан, невад, краму, кузню і г.д. У канцы 15 — пач. 16 ст. ў розных землях Русі С. складала розныя велічыні. З сярэдзіны 16 ст. ў Рас. дзяржаве ў якасці падатковай адзінкі ўведзена т.зв. вялікая С., якая складалася з пэўнай колькасці чвэрцяў зямлі ў залежнасці ад катэгорыі ўладальнікаў (800—1200 чвэрцяў у свецкіх феадалаў, 600—800 у царквы, 500—700 у чарнасошных і дварцовых сялян) і якасці зямлі; для насельніцтва гар. пасадаў памер вял. С. вызначаўся пэўнай колькасцю двароў. У 1646 падворны прынцып вылічэння памеру С. ўведзены замест пазямельнага і ў сельскай мясцовасці. С. як адзінка падаткаабкладання скасавана ў 1679 з увядзеннем *падворнага абкладання*.

«САХА́», сельскагаспадарчы часопіс дэмакр. кірунку. Выдаваўся з крас. 1912 да кастр. 1913 у Вільні, з ліст. 1913 у Мінску на бел. мове, у студз. 1915 на 27-м нумары выданне спынена ў сувязі з набліжэннем фронту ў 1-ю сусв. вайну. У крас. — маі 1920 у Мінску выйшлі 2 нумары. З сак. 1927 да жн. 1931 выдаваўся ў Вільні (41 нумар). Усяго выйшла 70 нумароў. Рэдактары А.Уласаў (1912—15, 1920, 1928—29), У.Павалковіч (1927), М.Ільяшэвіч (1930—31). На старонках «С.» прапагандаваліся прагрэсіўныя метады апрацоўкі зямлі, палепшаныя гатункі насення, шматпольная сістэма севазвароту. Часопіс арыентаваў на спецыялізацыю гаспадаркі, развіццё жывёлагадоўлі, пісаў пра розныя аспекты садоўніцтва, агародніцтва, даваў госп. парады. У дарэв. пару ў «С.» выступалі А.Петрашкевіч, К.Сініцкі, Я.Пачопка (Я.Башкір), Ю.Бусел, Я.Крыўка, Я.Дыла (Н.Бываеўскі), Л.Папроцкі, Уласаў, А.Баніцэвіч і інш. У зах.-бел. перыяд часопіс пісаў пра наспелыя аграрныя рэформы, прычыны цяжкага становішча вёскі, крытычна ставіўся да хутарызацыі, знаёміў з навінкамі ў паляводстве і жывёлагадоўлі. Найб. актыўныя аўтары «С.» ў гэты час: Павалковіч, Л.Войцікава (З.Верас), М.Манцэвіч. *А.С.Ліс.*

САХА́ (ЯКУ́ЦІЯ), Рэспубліка Саха (Якуція), Якуція, у складзе Расійскай Федэрацыі. Размешчана на Пн Усх. Сібіры. Абмываецца морамі Лапцевых і Усх.-Сібірскім. Уключае *Новасібірскія астравы*. Пл. 3102,2 тыс. км^2. Нас. 989 тыс. чал. (2000), гарадскога 64,6%. Сярэдняя шчыльн. 0,3 чал. на 1 км^2. Больш густа заселены паўд. улусы (адм. раёны) рэспублікі. Жывуць якуты (33,4%), рускія (50,3%), украінцы (7,1%), народнасці Поўначы (2,3%), у т. л. эвенкі, эвены, юкагіры. Сталіца — г. *Якуцк*. Найб. гарады: Нерунгры, Мірны, Ленск, Алдан, Удачны.

Падняпроўская (магілёўская) **саха**.



Віцебская **саха**.

Прырода. Берагавая лінія моцна парэзаная (бухта Нордвік, зал. Анабарскі, Алянёцкі, Янскі, Калымскі, губа Буор-Хая з бухтай Тыксі). Большая ч. тэр. занята горнымі сістэмамі і пласкагор'ямі. На З Сярэднесібірскае пласкагор'е (выш. 500—700 м), якое на Пн абмежавана Паўн.-Сібірскай нізінай, на У — Цэнтральнаякуцкай раўнінай. У паўд. ч. Алданскае нагор'е (выш. 650—1000 м), на Пн ад яго Прыленскае плато, на Пд — Станавы хрыбет. На правабярэжжы р. Лена хрыбты Верхаянскі (выш. да 2389 м) і Чэрскага (выш. да 3147 м, г. Перамога), паміж імі Яна-Аймяконскае нагор'е. На Пн Яна-Індыгірская і Калымская нізіны, на ПнУ Юкагірскае пласкагор'е. Больш за 40% тэр. за Палярным кругам. Карысныя выкапні: алмазы, золата, волава, сурма, вальфрам, слюда, поліметал. і жал. руды, каменны і буры вугаль (*Паўднёва-Якуцкі вугальны басейн*, *Ленскі вугальны басейн*), прыродны газ і інш. Клімат рэзка кантынентальны, суровы. Сярэдняя т-ра студз. ад -28 °С на ўзбярэжжы да -50 °С на астатняй тэр. (у раёне Верхаянск—Аймякон — адзін з полюсаў холаду Паўн. паўшар'я з абс. мінімумам т-ры -72,2 °С), ліп. ад 2 °С на ўзбярэжжы да 19 °С у цэнтр. раёнах. Ападкаў 200—700 мм за год. Гал. рэкі: Лена (з прытокамі Алёкма, Алдан, Вілюй), Алянёк, Яна, Індыгірка, Калыма і інш. Больш за 700 значных азёр, пераважна мелкаводных. Вілюйскае вадасховішча. Паўсюдна пашырана шматгадовая мерзлата. Глебы мярзлотна-таежныя, дзярнова-лясныя, алювіяльна-лугавыя, горна-лясныя і тундрава-глеевыя. Пад лесам (даўрская лістоўніца, хвоя, кедравы сланік, елка, піхта, бяроза) каля 80% тэрыторыі. У далінах рэк і на *аласах* пашыраны лугі. На Пн і ў гарах тундра. У складзе жывёльнага свету пясец, собаль, заяц-бяляк, ліс, гарнастай, паўн. алень, лось; трапляюцца кабарга, ізюбр, снежны баран. У морах — омуль, муксун, нельма, чыр, рапушка, у рэках — акунь, сіг, шчупак, асетр, мянтуз, таймень. Алёкмінскі і Усць-Ленскі запаведнікі.

Гісторыя. Чалавек насяляе тэр. С. (Я.) з часоў палеаліту. У 6—10 ст. н.э. з Прыбайкалля на Сярэднюю Лену прыйшлі цюркамоўныя плямёны, якія асімілявaліся з мясц. насельніцтвам і ўтварылі ядро якуцкага (саха) народа. У першабытнаабшчынным ладзе якутаў, якія займаліся жывёлагадоўляй, паляваннем і рыбалоўствам, у 17 ст. зараджаюцца элементы феад. адносін. Якуцкія плямёны на чале з таёнамі (князямі) насялялі сярэдняе цячэнне Лены, нізоўе Вілюя і вярхоўе Яны; у 2-й пал. 17 ст. яны рассяліліся па нізоўях Лены, Яны, на Алянёку, Індыгірцы, Алазеі і Калыме. З прыходам у 1620—30-я г. рус. казакоў якуты ў 1632 прызналі ўладу рас. цара. Рус. казакі засн. ў 1632 г. Якуцк. У 1638 утворана Якуцкае ваяводства. У 17—18 ст. якуты плацілі натуральны падатак — *ясак*. Частка іх перайшла да земляробства. З 1708 якуцкія землі ў складзе Сібірскай, з 1764 — Іркуцкай губ. У 1760-я г. забаронены купля і продаж зямлі, за валасцямі замацаваны зямельныя ўчасткі, склалася т. зв. класная абшчынная сістэма землекарыстання (існавала да 1920). У 1805 утворана Якуцкая вобл., якой кіраваў начальнік, падпарадкаваны іркуцкаму губернатару; з 1851 вобласцю (у складзе Іркуцкага ген.-губернатарства) кіраваў асобны губернатар. Паводле «Статута аб кіраванні іншародцаў» 1822 якуты прылічаны да «качавых іншародцаў». У сярэдзіне 19 ст. ў бас. рэк Алёкма і Віцім знойдзена золата. Буд-ва Сібірскай чыг., узнікненне золатаздабыўной прам-сці і суднаходства па Лене спрыялі развіццю ў С. (Я.) з канца 19 ст. элементаў капіталіст. адносін, фарміраванню нац. буржуазіі. З 19 ст. рас. царызм выкарыстоўваў тэр. С. (Я.) як месца ссылкі. Сярод сасланых па паліт. матывах былі беларусы Р.А.*Васільеў*, А.А.Касцюшка-Валюжаніч і інш. Тут праводзіў свае даследаванні і памёр (1892) у час падарожжа па р. Калыма І.Дз.*Чэрскі*. У рэвалюцыю 1905—07 у С. (Я.) узніклі дэмакр. саюзы і с.-д. арг-цыі, вясной 1917 — К-т РСДРП, Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, прафсаюзы. З восені 1917 улада ў Якуцку знаходзілася ў руках антыбальшавіцкага Якуцкага абл. савета. З дапамогай атрадаў Чырв. Арміі 1.7.1918 устаноўлена Сав. ўлада. У жн. 1918 тэр. С. (Я.) занята белагвардзейцамі. Сав. ўлада адноўлена ў снеж. 1919 — сак. 1920. 27.4.1922 утворана Якуцкая Аўт. Сав. Сацыяліст. Рэспубліка ў складзе РСФСР. У Вял. Айч. вайну больш за 50 тыс. ураджэнцаў С. (Я.) змагаліся на франтах, 13 з іх прысвоена званне Героя Сав. Саюза. За гады Сав. улады якуцкі (саха) народ кансалідаваўся ў нацыю, створаны сучасныя галіны прам-сці, у т. л. алмазаздабыўная. У вер. 1990 абвешчаны дзярж. суверэнітэт рэспублікі. У кастр. 1991 уведзена пасада прэзідэнта (у 1991—2002 М.Я.Нікалаеў, з 2002— В.А.Штыроў). У снеж. 1991 прынята сучасная назва — С. (Я.). 31.3.1992 С. (Я.) разам з інш. суб'ектамі Рас. Федэрацыі падпісала Федэратыўны дагавор.

Гаспадарка. Аснову эканомікі С. (Я.) складае горназдабыўная прам-сць (77,4% кошту прамысл. прадукцыі, 1999). Здабыча алмазаў (Мірны, Удачны, Айхал), золата (бас. рэк Алдан і Індыгірка), волава (Дэпутацкі, Эсэ-Хая), сурмы (Усць-Нера), слюды (Алдан, Тамот, Канкунскі). Паліўна-энергет. комплекс (17,7%) грунтуецца на мясц. вугалі, прыродным газе, гідраэнергарэсурсах і прывазных нафтапрадуктах. Здабыча каменнага і бурага вугалю 10 млн. т (1999, Нерунгры, Сангар, Кангаласы), прыроднага газу (Вілюйск, Сангар), вытв-сць электраэнергіі 7,4 млрд. кВт · гадз (1999), Вілюйская ГЭС, Нерунгрынская, Чульманская, Якуцкая ДРЭС. Прадпрыемствы дрэваапр., буд. матэрыялаў, маш.-буд., лёгкай, харч., у т. л. рыбнай, прам-сці. Лясная і дрэваапр. прам-сць (вытв-сць піламатэрыялаў — 106,5 тыс. м³, мэблі) у Якуцку, Вілюйску, Алёкмінску, Ленску, маш.-буд. — у Нерунгры (рамонтна-мех.) і Якуцку (суднарамонт), металаапр. — у Алдане. Вытв-сць буд. матэрыялаў (у т.л. цэменту — 104 тыс. т) у Якуцку, Нерунгры, Мірным, Алдане, Сангары, Ленску, Тамоце. Лёгкая прам-сць (швейная, гарбарна-абутковая) у Якуцку, харч. — у Якуцку, Нерунгры, Ленску і інш. Вытв-сць

сувеніраў у Якуцку. Гал. галіна сельскай гаспадаркі — жывёлагадоўля (мяса-малочная, мяса-табуновая конегадоўля); на Пн — аленегадоўля. Свіна- і птушкагадоўля. Развіта звярагадоўля (серабрыста-чорны ліс, блакітны пясец, норка), паляўнічы (вавёрка, белы пясец, гарнастай, ліс, собаль, андатра) і рыбны промыслы. Пагалоўе (тыс. галоў, 1999) буйн. раг. жывёлы 273,5, свіней 20,4. Пасяўныя пл. (тыс. га, 1999) 59,9, з іх пад збожжавымі (пшаніца, ячмень, авёс) 23,7, бульбай і агароднінай 11,4, кармавымі 24,8. Пасевы збожжавых у цэнтр. і паўд. раёнах, бульбу і агародніну вырошчваюць у цэнтр. ч., на Пд і З. Асн. віды транспарту паветраны і водны. Аэрапорты ў Якуцку, Нерунгры, Мірным, Вілюйску, Алёкмінску, Ленску, Тыксі, Верхаянску, Чэрскім. Суднаходства па *Паўночным марскім шляху*, рэках Лена, Алдан, Вілюй, Анабар і інш. Марскія парты: Тыксі, Зялёны мыс (Чэрскі). Даўж. чыгункі 165 км (Бамаўская чыг. лінія — Тында—Беркакіт—Нерунгры). Аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 7071 км, гал. Амура-Якуцкая аўтамагістраль (Беркакіт—Тамот—Якуцк) і Якуцк—Хандыга—Магадан. С. (Я.) пастаўляе ў інш. рэгіёны Расіі і за мяжу алмазы, золата, волава, піламатэрыялы, пушніну; завозіць нафтапрадукты, прадукцыю машынабудавання, тавары лёгкай, харч. прам-сці і інш.

вайну, змены ў жыцці народа. У Вял. Айч. вайну патрыят. творы стваралі С.Васільеў-Барагонскі, Эрылік Эрысцін, Ама Ачыгыя, Кюнюк Урастыраў, Эляй і інш. У пасляваен. гады распрацоўваліся тэмы Вял. Айч. вайны (І.Нікіфараў, Л.Папоў), стваральнай працы (Сямён *Данілаў*, Сафрон Данілаў, М.Яфімаў, І.Гогалеў). У 1960—90-я г. л-ра папоўнілася творамі П.Табурокава, М.Якуцкага, М.Габышава, С.Руфава, С.Тарасава, А.Сырамятнікавай і інш. На бел. мову асобныя творы Абагінскага, Айунскага, Сафрона Данілава, Сямёна Данілава, Кюндэ, Сафронава, Яфімава перакладалі А.Вольскі, С.Міхальчук, У. Правасуд, Я.Семяжон. Асобнымі выданнямі выйшлі аповесці В.Гаўрыльевай «Краіна Уот-Джулустана» (1981), казка «Жураўлінае пяро» (1988).

Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. На тэр. С. (Я.) знойдзены арнаментаваная кераміка, маст. вырабы з металу, наскальныя выявы (жывёлы, сцэны палявання) часоў неаліту і бронзы. Стараж. жыллё якутаў — прамавугольная ў плане юрта, з 19 ст. пашыраны драўляныя хаты. Традыц. віды нар. мастацтва: разьба па дрэве і косці, чаканка і гравіроўка па метале, дробная пластыка, выраб футравага адзення, аздобленага мазаікай і аплікацыяй. У 20 ст. пааднаўляліся старыя і ўзнікалі новыя гарады (Алдан, Ленск, Мірны) і гар. пасёлкі (Чарнышэўскі і інш.). Ва ўмовах вечнай мерзлаты будынкі (шматпавярховыя, цагляныя ці каменныя) узводзілі пераважна на слупкаватых ці палевых фундаментах. Сярод найб. значных архітэктараў-праекціроўшчыкаў С.Данілаў, В.Пятроў, І.Смалькоў і інш. У 1964 створаны Саюз архітэктараў С. (Я.). Выяўл. мастацтва пач. 20 ст. прадстаўлена творчасцю М.Носава і І.Папова. У 1920—30-я г. працавалі першыя мастакі-якуты — П.Раманаў, Г.Туралысаў, П.Дабрынін. Сярод мастакоў 2-й пал. 20 ст. жывапісцы А.Осіпаў, М.Лукін, В.Пятроў, Л.Габышаў, графікі Э.Сіўцаў, В.Васільеў, разьбяры па косці Дз.Нікіфараў, І.Мамаеў і інш.

Музыка. Аснову муз.-паэт. фальклору якутаў складае гераічны эпас аланхо. Асн. жанры як. нар. музыкі — працяжныя і мерныя песні. Працяжным уласцівы свабодная форма, пераменны метр і лад. Мелодыі мерных песень рытмічна выразныя і ладава акрэсленыя (лірычныя, танц., а таксама т. зв. паднябенныя, якія выконваюцца з характэрным прыцмокваннем). З танцаў вядомы асуахай, з інструментаў — хамуз (варган), кюпсюр (барабан), дзюнгюр (шаманскі бубен), самаробная скрыпка і запазычаныя ад рускіх балалайка і баян. У 1843 упершыню як. нар. песні запісаў А.Мідэндорф. У 1927 выдадзены першы зб. як. песень (у ім змешчаны апрацоўкі М.Аладава). Найб. вядомыя музыканты: Ф.Карнілаў, А.Скрабін, М.Жыркоў, З.Вінакураў. На як. муз. мастацтва паўплывалі Г.Ліцінскі (першыя нац. оперы і балеты разам з М.Жырковым), М.Пяйко, Г.Грыгаран, С.Кандрацьеў і інш. Сярод як. выканаўцаў спевакі М.Лабанаў, А.Лыткіна, Н.Шапялёва, А.Ільіна, хар. дырыжор Ф.Баішава, балерына А.Сцяпанава. Працуюць Муз.-драм. т-р імя П.Айунскага, муз. т-р, філармонія, ансамбль танца, сімф. аркестр, хор радыё і тэлебачання, муз. вучылішча, муз. школа. Саюз кампазітараў С. (Я.) з 1979.

Літ.: Иванов В.Н. Социально-экономические отношения у якутов, XVII в. Якутск, 1966; Гоголев А.И. Историческая этнография якутов. Якутск, 1986; Зыков Ф.М. Поселения, жилища и хозяйственные постройки якутов XIX— нач. XX в. Новосибирск, 1986.

Л.В.Лоўчая (прырода, гаспадарка), *М.Г.Нікіцін* (гісторыя).

Да арт. **Саха (Якуція)**. Здабыча золата.

Літаратура. Развіваецца на *якуцкай мове*. Вытокі ў багатым і разнастайным фальклоры; асабліва пашыраны гераічны эпас *аланхо*. Пісьмовая л-ра зарадзілася з узнікненнем перыяд. друку ў перыяд рэвалюцыі 1905—07. У творах А.*Кулакоўскага*, А.Сафронава побыт якутаў, іх цяжкае жыццё. Заснавальнік як. сав. л-ры — П.*Айунскі*. У 1920—30-я г. выступілі паэты С.*Эляй*, А.Абагінскі (Кудрын), А.Кюндэ (Іваноў), Кюнюк Урастыраў (У.Новікаў), празаікі Ама Ачыгыя (М.Мордзінаў), Эрылік Эрысцін (С.Якаўлеў), драматург Суарун Амалон (Дз.Сіўцаў) з творамі пра грамадз.

САХАЛІ́Н, востраў каля ўсх. ўзбярэжжа Азіі, у Сахалінскай вобл. Расіі. Абмываецца Ахоцкім і Японскім морамі. Ад мацерыка аддзелены Татарскім пралівам (у вузкім месцы наз. Невяльскога), Амурскім ліманам і Сахалінскім зал., ад Японскіх а-воў — пралівам Лаперуза. Пл. 76,4 тыс. км^2. Даўж. 948 км, шыр. ад 27 да 160 км. Берагі слаба парэзаныя, буйныя залівы Аніва і Цярпення, п-вы Шміта, Цярпення, Таніна-Аніўскі, Крыльёнскі рэзка выступаюць у мора. Уздоўж берагоў цягнуцца Зах.-Сахалінскія (выш. да 1330 м, г. Онар) і Усх.-Сахалінскія горы (выш. да 1609 м, г. Лапаціна). Паміж імі Тым-Паранайская нізіна, на Пн — Паўн.-Сахалінская раўніна. Бываюць землетрасенні да 8 балаў (на Пн). Карысныя выкапні: нафта, газ, кам. і буры вугаль, золата. Клімат мусонны, больш халодны пад уплывам Ахоцкага м. летам і сіб. кантынент. мусону зімой. Найб. цёплае паўд.-зах. ўзбярэжжа С. (уплыў Цусімскага цячэння). Сярэднія т-ры студз. ад -6 °С на Пд да -24 °С на Пн, жн. ад 19 °С на Пд да 10 °С на Пн. Ападкаў за год 500—600 мм на раўнінах, да 1200 мм у гарах. Рэкі кароткія, мнагаводныя; найб. — Тым і Паранай. Шмат дробных азёр, балот. Ёсць тэрмальныя і мінер. крыніцы. Глебы тарфяна-падзоліста-балот-

ныя, алювіяльныя лугава-дзярновыя, у гарах бура-таежныя, трапляюцца горныя падзолістыя. Каля $^2/_3$ тэр. занята лясамі. На Пн лістоўнічная тайга, у цэнтр. ч. лясы з аянскай елкі і сахалінскай піхты. На ПдЗ мяшаныя лясы з ліянамі (актынідыя, лімоннік, вінаград), на З — з падлескам з курыльскага бамбуку. У гарах зараснікі каменнай бярозы і кедравага сланіку. Жывёльны свет сіб. тыпу, збеднены астраўной ізаляцыяй. Трапляюцца мядзведзь, собаль, вавёрка, бурундук, расамаха. Птушыныя кірмашы (кайры, тапаркі, бакланы). Лежбішчы марскіх жывёл (сівуч, марскі коцік). Паранайскі запаведнік. Звесткі пра гаспадарку, карту гл. ў арт. *Сахалінская вобласць*.

С. заселены больш за 4 тыс. г. назад, яго найстараж. насельнікі — тончы, айны, ніўхі, эвенкі. Першымі з еўрапейцаў берагі вострава ўбачылі рус. казакі атрада І.Ю.Масквіціна ў 1640, у 1643 — галандскі мараплавец М.Г. дэ Фрыз. Першыя звесткі пра С. атрыманы ўдзельнікамі паходу рус. землепраходца В.Д.*Паяркава* (1643—46). Даследаванне С. пачата ў 18—19 ст. экспедыцыямі француза Ж.Ш.*Лаперуза*, рус. І.Ф.*Крузенштэрна* і Г.І.*Невяльскога*. З сярэдзіны 19 ст. рускія пачалі гасп. асваенне вострава. Паводле рус.-яп. дагавора 1875 прызнаны ўладаннем Расіі. З 1860-х г. С. — месца ссылкі і катаргі. Пасля паражэння Расіі ў рус.-яп. вайне 1904—05 Паўд. С. адышоў да Японіі. У 1920 Японія акупіравала і паўн. частку С., якая з 1925 зноў у складзе РСФСР. 20.10.1932 тут утворана Сахалінская вобл. У канцы 2-й сусв. вайны (жн. 1945) Паўд. С. заняты сав. войскамі і ў адпаведнасці з рашэннямі Крымскай і Патсдамскай канферэнцый 1945 перададзены СССР. У 1946 тут утворана Паўд.-Сахалінская вобл.; у студз. 1947 яна скасавана, яе тэр. ўключана ў Сахалінскую вобл.

САХАЛІ́НСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на крайнім У Расійскай Федэрацыі, на а-вах Сахалін, Курыльскіх, Манерон, Цюленевы і інш. Абмываецца Ахоцкім і Японскім морамі. Утворана 20.10.1932. Пл. 87,1 тыс. км^2. Нас. 599 тыс. чал. (2000), гарадскога 86%. Цэнтр — *Южна-Сахалінск*. Найб. гарады: Холмск, Карсакаў, Аха, Паранайск. Прыроду гл. ў арт. *Сахалін* і *Курыльскія астравы*.

У гаспадарцы вядучае месца належыць прам-сці (60% сукупнага прадукту). Гал. галіна прам-сці — рыбная (32% валавой прадукцыі) прадстаўлена здабычай і перапрацоўкай рыбы (ласось, селядзец, сайра, камбала, мінтай, скумбрыя, траска і інш.), крабаў, крэветак, малюскаў, кальмара, водарасцей; улоў рыбы і морапрадуктаў 507 тыс. т, выраблена 367,3 тыс. т харч. рыбных прадуктаў (1999). Паліўна-энергет. комплекс уключае здабычу нафты (1,7 млн. т, 1999; запасы —36,5 млн. т), газу (1,8 млрд. м^3; 56,5 млрд. м^3), каменнага і бурага вугалю (2,5 млн. т; 20 млрд. т), торфу, выпрацоўку электраэнергіі (2,5 млрд. кВт · гадз). Асн. цэнтры здабычы нафты і газу — Аха, Тунгор; вугалю — Паранайск, Вуглегорск, Шахцёрск, торфу — Тым-Паранайская нізіна. Сахалінская ДРЭС, Южна-Сахалінская ЦЭЦ-1, Ахінская ЦЭЦ; на в-ве Кунашыр першая геатэрмальная эл. станцыя. Развіты лесанарыхтоўка, дрэваапрацоўчая і цэлюлозна-папяровая прам-сць (вытв-сць кардону, цэлюлозы, паперы, дзелавой драўніны, піламатэрыялаў), машынабудаванне і металаапрацоўка (рамонт абсталявання, вытв-сць металавырабаў, суднабудаванне і суднарамонт), лёгкая і харч. прам-сць. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Пад пасяўнымі пл. 41,6 тыс. га. Пераважае ачаговая прыгарадная сельская гаспадарка. Вырошчваюць кармавыя культуры, бульбу, агародніну. Малочна-мясная жывёлагадоўля. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак, коз. Птушкагадоўля. Звярагадоўля, на Пн — аленегадоўля. Паляўнічы промысел. Рыбагадоўля (пераважна ласасёвыя). Збор ягад і раслін. Даўж. чыгункі 957 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 1808 км. Паромная чыг. пераправа Холмск—Ваніна і Карсакаў—Ваканай (Японія). Марскі транспарт. Гал. парты: Холмск, Карсакаў; Невельск, Вуглегорск, Аляксандраўск-Сахалінскі, Маскальво. Аэрапорт у г. Южна-Сахалінск. Нафта- і газаправод Аха—Камсамольск-на-Амуры. Бальнеалагічныя курорты: Сінягорскія мінер. воды (г. Южна-Сахалінск) і Гарачы Пляж (в-аў Кунашыр). *В.М.Корзун.*

САХА́РА (Sajama), патухлы вулкан каля ўсх. падножжа Зах. Кардыльеры Андаў у Балівіі. Выш. 6520 м. Да выш. 6000 м укрыты беднай паўпустыннай раслінасцю, вышэй — вечныя снягі.

САХА́РА (ад араб. сахра—пустыня), пустыня ў Паўн. Афрыцы, самая вялікая на зямным шары. Пл. каля 7 млн. км^2. Працягваецца на 5,7 тыс. км ад Атлантычнага ак. на З да Чырвонага м. на У. Шыр. да 2 тыс. км. На Пн мяжуе з паўд. перадгор'ямі Атласа і ўзбярэжжам Міжземнага м. На Пд пераходзіць у *Сахель* (паўд. мяжа можа перамяшчацца на Пн ці Пд у залежнасці ад вільготнасці года). На тэр. С. размешчаны поўнасцю або часткова дзяржавы: Марока, Туніс, Алжыр, Лівія, Егіпет, Зах. Сахара, Маўрытанія, Малі, Нігер, Чад, Судан. У рэльефе пераважаюць раўніны выш. 200—500 м, у Цэнтр. С. — нагор'і: Ахагар (г. Тахат, 3003 м), Тыбесты (г. Эмі-Кусі, 3415 м, найб. выш. С.); плато: Аір, Энеды, Адрар-Іфарас і інш. Уздоўж Чырвонага м. выцягнуты хр. Этбай (выш. больш за 2000 м). На Пн і У размешчаны шматлікія бяссцёкавыя ўпадзіны, некат. з іх ніжэй узр. м.: Катара (-133 м), Шот-Мельгір (-26 м) і

інш. У ландшафтах С. пераважаюць пустыні: камяністыя і друзавыя (хамады), галечнікавыя (рэгі), гліністыя (серыры), пясчаныя (у т.л. эргі), саланчаковыя (себхі); астатнюю тэр. займаюць горныя ландшафты з друзавата-камяністымі пустынямі. Паверхню часта ўскладняюць градавыя пяскі (бываюць грады выш. да 200—300 м) і дзюны круглыя або зоркападобныя.

С. займае паўн.-зах. ч. Афрыкана-Аравійскай платформы, дакембрыйскі фундамент якой выходзіць у масівах Цэнтральна-Сахарскай зоны паднятняў (Рэгібацкае, Ахагар, Тыбесты, Эль-Увейнат) і зах. выступе Нубійска-Аравійскага масіву. На Пн і Пд знаходзяцца зоны пагружэнняў, запоўненыя адносна маламагутным чахлом фанерозойскіх адкладаў. Радовішчы нафты і газу (*Сахара-Лівійскі нафтагазаносны басейн*), жалезных і медных руд, фасфарытаў.

Клімат С. пераважна трапічны пустынны, на Пн — субтрапічны. Круглы год пераважае паўн.-ўсх. пасат. Частыя вятры скорасцю да 50 м/с (хамсін, самум, сірока, шэргі) і пыльныя буры. Сярэднія т-ры студз. 10 °С і больш (у гарах маразы); ліп. да 37 °С, абс. макс. 57,8 °С (Эль-Азізія ў Лівіі), абс. мінім. -18 °С (у Тыбесты). Вял. сутачныя амплітуды т-р паветра (больш за 30 °С) і глебы (да 70 °С). Характэрны сухое паветра (адносная вільготнасць 30—50%) і высокая выпаральнасць (да 6000 мм). На б.ч. тэр. С. ападкаў менш за 50 мм за год, на ўскраінах 100—200 мм. На Пн С. ападкі пераважна зімовыя, на Пд — летнія. С. — вобласць унутранага сцёку. Пастаяннымі вадацёкамі з'яўляюцца ўчасткі транзітных рэк Ніл і Нігер. Па сухіх рэчышчах (вадзі або уэды) эпізадычна сцякаюць лівневыя воды. Вял. басейн падземных вод, у т.л. артэзіянскіх, забяспечвае жыццё ў *аазісах*. Свідраванне на ваду вядзецца ў раёнах здабычы нафты і газу. Характэрны прымітыўныя глебы трапічных пустынь і паўпустынь (пясчаныя, друзаватыя, галечныя, гліністыя), часта засоленыя. Пашыраны вапнякова-гіпсавыя коры. Расл. покрыва залежыць ад тыпу пустынь: хамады і рэгі без расл. або з моцна разрэджаным покрывам, эргі замацаваны доўгакаранёвымі бязлістымі хмызнякамі і злакамі (сахарскі дрок, эфедра, дрын). На Пд С. з дрэвава-хмызнякоўых найб. частыя акацыі, тамарыскі і інш. У горных раёнах захаваліся рэлікты неагенавай флоры (ядловец, алеандр, кіпарыс). Найб. пашыраныя прадстаўнікі жывёльнага свету: антылопа адакс, газелі, муфлон, фенек, гепард, гіена, шакал, пясчанкі, тушканчыкі, сахарскі заяц, сцынкі, вараны, рагатая гадзюка, кобра і інш. Качавая і паўкачавая жывёлагадоўля (вярблюды, авечкі, козы), земляробства ў аазісах (фінікавая пальма, збожжавыя, агародніннyя культуры), развіта горназдабыўная прамысць, з 1950—60-х г. С. — буйнейшы нафтаздабыўны раён свету. Гал. гарады: Тугурт, Уаргла, Лагуат, Туат, Тыдыкельт (Алжыр), Куфра, Себха, Тазерба, Джагбуб, Мурзук (Лівія), Сіва, Дахла, Фарафра, Бахарыя (Егіпет). У перавозках грузаў, акрамя нафты і газу (транспартуюцца па трубаправодах), вял. значэнне маюць транссахарская аўтадарога ад Алжыра да Нігера з бітумным пакрыццём да г. Айн-Салах і авіялініі; чыгункі: Абадла — паўн. Алжыр — Марока, Тугурт — Міжземнаморскае ўзбярэжжа, Кедыя — д'Іджыль — узбярэжжа Атлантычнага акіяна. *М.В.Лаўрыновіч.*



Да арт. **Сахара**. 1 — вытачаныя эрозіяй рэшткі старажытных асадкавых фармацый, Эгіе-дзю-Сіс; 2 — рэг — участак пустыні, укрыты камянямі і галькай; 3 — аазіс Тагіт.

САХА́РА-ЛІВІ́ЙСКІ НАФТАГАЗАНО́СНЫ БАСЕ́ЙН. Размешчаны на тэр. Алжыра, Лівіі, Туніса і Егіпта. Уключае Алжыра-Лівійскі і Сахара-Міжземнаморскі нафтагазаносныя басейны. Пл. каля 2,5 млн. км^2. Пач. запасы нафты 8,6 млрд. т, газу 4,8 трлн. м^3. Адкрыта больш за 250 нафтавых і газанафтавых і 60 газавых радовішчаў. Нафтагазаносныя адклады ад кембрыю да палеагену. Гал. нафтавыя радовішчы: *Серыр*, Амаль, Джалу, Насэр, Самах, Інтысар (Лівія); Хасі-Месауд, Зарзаіцін (Алжыр). Гал. газавыя радовішчы: Хасі-Рмель, Гурд-Нус (Алжыр), Хатэйба (Лівія).

САХАРАНПУ́Р, Шахаранпур, горад на Пн Індыі, у басейне верхняга Ганга, у штаце Утар-Прадэш. Каля 400 тыс. ж. (2000). Чыг. вузел. Прам-сць: цукр., дрэваапр., тэкст., папяровая.

САХА́РАЎ Андрэй Дзмітрыевіч (21.5.1921, Масква — 14.12.1989), расійскі фізік і грамадскі дзеяч. Акад. АН СССР (1953). Замежны чл. Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1969), Нац. АН ЗША (1973), Франц. АН (1981) і інш. Тройчы Герой Сац. Працы (1953, 1956, 1962). Скончыў Маскоўскі ун-т (1942). У 1945—50 і з 1969 у Фіз. ін-це АН СССР, з 1950 у ядз. цэнтры КБ-11 (г. Арзамас-16, цяпер г. Сароў). Навук. працы па магн. гідрадынаміцы, фізіцы плазмы, кіравальным тэрмаядз. сінтэзе, фізіцы элементарных часціц, касмалогіі, тэорыі гравітацыі. Прапанаваў выкарыстоўваць мюонны каталіз для ажыццяўлення кіравальнай тэрмаядз. рэакцыі (1948). Выказаў ідэю магн. ўтрымання высокатэмпературнай плазмы (1950) і разам з І.Я.*Тамам* развіў тэорыю магн. тэрмаядз. рэактара. Прапанаваў прынцып стварэння выбухова-магн. генератара для атрымання звышмагутных магн. палёў і эл. токаў (1952). Выказаў ідэю лазернага абціскання плазмы (1961), гіпотэзу аб нестабільнасці пратона і выкліканай ёй барыённай асіметрыі Сусвету (1967). Адзін са стваральнікаў вадароднай бомбы ў СССР (1953). У 1956—62 актыўна выступаў за абмежаванне выпрабаванняў ядз. зброі. З канца 1960-х г. адзін з лідэраў праваабарончага руху ў СССР. Пасля публікацыі на Захадзе арт. «Разважанні аб прагрэсе, мірным суіснаванні і інтэлектуальнай свабодзе» (1968) быў адхілены ад сакрэтных прац. За асуджэнне ўводу сав. войск у Афганістан пазбаўлены ўсіх дзярж. узнагарод і высланы ў г. Горкі (1980; вярнуўся ў 1986). Імем С. наз. малая планета. Дзярж. прэмія СССР 1953. Ленінская прэмія 1956. Нобелеўская прэмія міру 1975.

Тв.: Мир, прогресс, права человека. Л., 1990; Тревога и надежда. М., 1990; Науч. труды. М., 1995; Воспоминания. Т. 1—2. М., 1996.

Літ.: Конституционные идеи Андрея Сахарова. М., 1990; Андрей Дмитриевич: Воспоминания о Сахарове. М., 1990; Гражданин мира (А.Д.Сахаров): Рекомендат. указ. лит. М., 1993; Он между нами жил...: Воспоминания о Сахарове. М., 1996. *М.М.Касцюковіч.*

САХА́РАЎ Сяргей Пятровіч (29.9.1880, г. Полацк Віцебскай вобл. — 22.4.1954), бел. фальклярыст і этнограф. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю (1895), Юр'еўскі ун-т (г. Тарту, 1911). У 1911 — 13 выкладаў у гімназіях і Настаўніцкім ін-це ў Віцебску, адначасова сакратар *Віцебскай вучонай архіўнай камісіі*. З 1913 інспектар нар. школ у Юр'еўскім пав., з 1917 дырэктар-арганізатар Люцынскай (цяпер г. Лудза, Латвія) рус. гар. гімназіі. У 1919 заг. дашкольнага пададдзела Люцынскага павятовага аддзела нар. асветы, узначальваў Бел. аддзел пры Мін-ве асветы Латвіі (1921—25). У 1925—32 дырэктар Дзвінскай бел. гімназіі. У 1945 арыштаваны,

А.Дз.**Сахараў**.

С.П.**Сахараў**.

высланы ў Казахстан. Збіраць і публікаваць бел. фальклор пачаў у 1906. Выступаў у друку з навук.-папулярнымі нарысамі, прысвечанымі стараж. Полаччыне, князю Усяславу Брачыславічу, князёўне Ефрасінні Полацкай, а таксама бел. фальклярыстам М.Нікіфароўскаму, Е.Раманаву, П.Шэйну, гісторыку А.Сапунову. Выдаў некалькі календароў-кніжак. Апубл. арт. пра каменныя крыжы на Беларусі, стараж. нар. муз. інструменты, кнігадрукаванне. Падрыхтаваў 4 выпускі «Народнай творчасці латгальскіх і ілукстэнскіх беларусаў» (вып. 1, 1940; 414 песень і нотных запісаў). У вып. 2—4 (рукапіс) сабраны казкі, легенды, паданні, прыпеўкі, прыказкі, дзіцячы фальклор і інш. Рукапісы фалькл.-этнагр. матэрыялаў, пед., гіст.-этнагр. і літ.-публіцыст. спадчына С. зберагаюцца ў архівах навук. б-к Нац. АН Беларусі, Латвіі і Літвы.

Тв.: Народное образование в Юрьевском уезде. Юрьев, 1917; Гістарычны нарыс пяцігоддзя Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі за 1922—1927 гг. Дзвінск, 1927; Город Лудза в прошлом и настоящем. Рига, 1935; Полацкі князь Усяслаў — нацыянальны беларускі асілак. Вільня, 1939; Православные церкви в Латгалии. Рига, 1939. *А.С.Ліс.*

САХАРЧЎК Васіль Якаўлевіч (н. 10.7.1953, в. Свадзьбічы Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. паэт і перакладчык. Скончыў БДУ (1975). Настаўнічаў. З 1979 працуе ў жабінкаўскай раённай газ. (Брэсцкая вобл.). Друкуецца з 1971. У зб. паэзіі «Даніна» (1988) філас. асэнсаванне складаных праблем сучаснасці. Асвойвае цвёрдыя формы верша — тэрцыны, актавы і інш. Пераклаў з балг. мовы на бел. зб. лірыкі П.Яварава «Апалавы пярсцёнак» (1988, з Н.Гілевічам), зб. нарысаў «Дзеці-героі» (1991), паасобныя творы Л.Даскаловай, Х.Радзеўскага, Ф.Цютчава і інш.

САХЕ́ЛЬ (араб. — бераг, ускраіна), прыродная вобласць у Афрыцы, пераходная зона (шыр. да 400 км) ад пустынь *Сахары* да *саваннаў* прыэкватарыяльных абласцей Афрыкі. Працягваецца з З на У ад Маўрытаніі і Сенегала праз Малі, Буркіна-Фасо, Нігер і Чад да Судана і Эфіопіі. Пераважаюць паўпустыні і апустыненыя саванны. Ападкаў 200—600 мм за год (пераважна летам, ад 2—3 тыдняў да 3 месяцаў), 80—90% вільгаці выпараецца. У час перыядычных катастрафічных засух (у сярэднім праз 30 гадоў) С. ператвараецца ў нежылую пустыню. У паўн. С. пераважае разрэджаная паўпустынная расліннасць (дзернавінныя злакі, хмызнякі і нізкарослыя дрэвы, гал. чынам акацыі). На Пд — калючыя рэдкалессі, пальмавыя гаі (дум, ранье), баабабы. Прычына прагрэсіруючага апустыньвання ў многіх раёнах — звядзенне дрэвавай і хмызняковай расліннасці. Качавая жывёлагадоўля, на Пд пасевы проса і арахісу.

САХІ́ВАЛ, горад на У Пакістана, у міжрэччы Раві — Сатледж. Каля 200 тыс. ж. (2000). Трансп. вузел. Гандл. цэнтр с.-г. раёна (бавоўнік, пшаніца, цукр. трыснёг, малочная жывёлагадоўля). Прам-сць: баваўняная, харч. (мукамольная, цукр., малочная). Саматужная вытв-сць вырабаў з тэкстылю, скуры, металаў. За 30 км на З — руіны Харапы (помнік стараж. цывілізацыі — 2,5 тыс. г. да н.э.).

САХІ́ЕЎ Жуніс (н. 1.3.1950, аул Алмалы Паўд.-Казахстанскай вобл., Казахстан), казахскі пісьменнік-фантаст. Скончыў Каз. нац. ун-т (1977). З 1977 працаваў у перыяд. друку, з 1980 — у выд-ве «Раўан», з 1986 — у Дзяржкамдруку Рэспублікі Казахстан, з 1988 — у Каз. энцыклапедыі. Першы зб. навук.-фантаст. апавяд. — «Гняздо жыцця» (1983). Аўтар зб-каў аповесцей і апавяд. «Абавязак» (1987), «Злучэнне кальца» (1991), рамана «Качэўнікі з космасу» (1999), шматлікіх арт. пра сусв. навук. фантастыку, навук.-пазнавальных арт. пра астраномію. Асобныя яго навук. фантаст. творы ўвайшлі ў калект. зб-кі «Свежы ветрык» (1977), «Агністы камень» (1981), «Падарожжа ў іншы свет» (1984), «Чырвоны прамень» (1986), «Зборнік казахскіх пісьменнікаў-фантастаў» (2000). *М.А.Абішава.*

САХНЁНКА Віктар Іванавіч (7.1.1923, г. Дружкоўка Данецкай вобл., Украіна — 26.4.1973), бел. жывапісец. Скончыў Кіеўскі маст. ін-т (1953). У 1963—67 выкладаў у Бел. тэатр.-маст. ін-це. Працаваў пераважна ў жанрах тэматычнай карціны і партрэта. Творы адметныя псіхал. выразнасцю вобразаў, кампазіцыйным майстэрствам, напружаным каларыстычным вырашэннем, дакладнасцю малюнка. Сярод лепшых работ: тэматычныя карціны «У Данбасе» (1959), «Май» (1967), «Наша свята» (1968), «Трактарабудаўнікі» (1969), «Спакой» (1970), трыпціх «Ураджай» (1971—72), кампазіцыі аб Вял. Айч. вайне — «Ваенны карэспандэнт» (1964), «Салдаты» (1968), «Стары партызан» (1969), «Гвардзейская клятва» (1972), лірычныя пейзажы Закарпацця, Браслаўшчыны, нацюрморты, партрэты пісьменніка М.Паслядовіча (1967), паэта В.Таўлая (1970), мастакоў А.Паслядовіч (1967), М.Савіцкага (1972) і інш. Афармляў кнігі. *А.Я.Белы.*

В.**Сахненка**. Народны мастак СССР М.А.Савіцкі. 1972.

САХНЁНКА Людміла Іванаўна (н. 12.4.1950, в. Петушкі Круглянскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. спартсменка (міжнар. і рус. шашкі). Міжнар. гроссмайстар (1984). Майстар спорту СССР (1973). Канд. мед. н. (1987). Скончыла Мінскі мед. ін-т (1973). З 1980 у Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў. Чэмпіёнка (1979, Мінск), віцэ-чэмпіёнка (1977, Амстэрдам) свету; чэмпіёнка СССР (1979) па міжнар. і рус. (1974) шашках у асабістым першынстве. Неаднаразовы прызёр чэмпіянатаў свету і СССР. З 1990 у Нідэрландах.

САХНО́ЎСКІ Васіль Рыгоравіч (1.3.1886, г. Дарагабуж Смаленскай вобл., Расія — 26.2.1945), расійскі рэжысёр, тэатразнавец, педагог. Нар. арт. Расіі (1938). Д-р мастацтвазнаўства (1939). Вучыўся на рэжысёрскім ф-це Фрайбургскага ун-та, скончыў Маскоўскі ун-т (1910). З 1912 працаваў у Маскве ў студыі Ф.Камісаржэўскага (з 1914 — тэатр В.Камісаржэўскай), спачатку лектарам, пасля рэжысёрам. У 1921—22 у створаным ім Маскоўскім драм. т-ры паставіў «Набожнасць» П.Мерымэ, «Навальніцу» А.Астроўскага. З 1922 рэжысёр і маст. кіраўнік Т-ра камедыі (б. Т-ра Корша), з 1923 зноў адкрытага Т-ра імя Каміс-

саржэўскай. З 1926 рэжысёр, з 1932 нам. дырэктара, з 1937 заг. маст. часткі, з 1940 намеснік маст. кіраўніка Маскоўскага Маст. акад. т-ра (МХАТ), з 1943 чл. Маст.-рэжысёрскай калегіі. У 1914—20 выкладаў у Нар. ун-це імя А.Шаняўскага, з 1933 узначальваў рэжысёрскі ф-т і кафедру рэжысуры Дзярж. ін-та тэатр. мастацтва. Адзін з заснавальнікаў Школы-студыі МХАТ, з 1943 маст. кіраўнік. Удзельнічаў у стварэнні спектакляў «Дзядзечкаў сон» паводле Ф.Дастаеўскага (маст. кіраўнік Неміровіч-Данчанка, 1929), «Мёртвыя душы» паводле М.Гогаля (маст. кіраўнік К.Станіслаўскі, 1932), «Ягор Булычоў і іншыя» М.Горкага (маст. кіраўнік Неміровіч-Данчанка, 1934), «Ганна Карэніна» паводле Л.Талстога (з Неміровічам-Данчанкам, 1937), паставіў «Палаўчанскія сады» Л.Лявонава (1939), «Працоўны хлеб» А.Астроўскага (1940).

Тв.: Письмо К.С.Станиславскому. М., 1917; Работа режиссера. М.; Л., 1937; Режиссура и методика ее преподавания. М.; Л., 1939; Мысли о режиссуре. М.; Л., 1947.

САХУ́ТА Яўген Міхайлавіч (н. 15.2.1945, в. Вечатарова Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл.), бел. мастацтвазнавец. Д-р мастацтвазнаўства (1996). Скончыў Віцебскі пед. ін-т (1972). З 1975 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі, адначасова ў 1985—91 гал. рэдактар час. «Мастацтва Беларусі». Даследуе тэорыю, гісторыю і сучасны стан бел. нар. дэкар.-прыкладнога мастацтва і нар. маст. промыслаў. Адзін з аўтараў кн. «Грамадскі, сямейны побыт і духоўная культура насельніцтва Палесся» (1987), «Гісторыя беларускага мастацтва» (т. 1—6, 1987—94, Дзярж. прэмія Беларусі 1996), «Беларусы» (т. 1. Прамысловыя і рамесныя заняткі, 1995), «Беларусы» (1998). Аўтар-складальнік альбома «Вечназялёнае дрэва рамёстваў» (1997). З 1992 старшыня Бел. саюза майстроў нар. творчасці.

Тв.: Народная разьба па дрэву. Мн., 1978; Беларускае народнае мастацтва: [Альбом]. Мн., 1980; Народное искусство и художественные промыслы Белоруссии. Мн., 1982; Фарбы роднай зямлі. Мн., 1985; Беларуская народная кераміка. Мн., 1987; Художественные ремесла и промыслы Белоруссии. Мн., 1988 (разам з В.А.Говарам); Беларускае народнае мастацкае кавальства. Мн., 1990; Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Мн., 1996; Народныя мастацкія рамёствы Беларусі. Мн., 1996 (у сааўт.); Народнае мастацтва Беларусі. Мн., 1997.

САХ'ЯДРЫ́, горы на паўвостраве Індастан, гл. *Заходнія Гаты*.

САХ'Я́НАВА Ларыса Пятроўна (н. 13.2.1930, с.Кырэн, Бурацыя), расійская артыстка балета, балетмайстар. Нар. арт. СССР (1963). Скончыла Маскоўскае харэагр. вучылішча (1951). З 1946 салістка Бурацкага т-ра оперы і балета, з 1962 адначасова маст. кіраўнік Бурацкага харэагр. вучылішча. Выканальніца вядучых партый у нац. балетах: Алтан («Святло над далінай» С.Раўзава), Сэсэг («У імя кахання» Ж.Батуева і Б.Майзеля), Ангара («Прыгажуня Ангара» Л.Кніпера і Б.Ямпілава), Каця («Апошні баль» Ю.Бірукова); з клас. рэпертуару: Гюльнара, Жызэль («Карсар», «Жызэль» А.Адана), Адэта—Адылія, Аўрора («Лебядзінае возера», «Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Раймонда («Раймонда» А.Глазунова), Нікія, Кітры («Баядэрка», «Дон Кіхот» Л.Мінкуса) і інш. Дзярж. прэмія Расіі імя М.Глінкі 1972.

Літ.: Ильин С. Судьба балерины // Байкал. 1969. №1. *Л.А.Сівалобчык.*

Я.М.Сахута.

Н.І.Сац.

САЦ Наталля Ільінічна (27.8.1903, г. Іркуцк, Расія — 18.12.1993), расійскі рэжысёр, тэатральны дзеяч. Дачка кампазітара І.Саца. Нар. арт. СССР (1975). Герой Сац. Працы (1983). Скончыла муз. тэхнікум імя А.Скрабіна (1917), Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва (1953), з 1984 праф. у ім. У 1918 заг. дзіцячага сектара тэамузсекцыі Массавета. Ініцыятар стварэння першага пастаяннага т-ра для дзяцей (Дзіцячы т-р Массавета, 1918). У 1920—36 дырэктар і маст. кіраўнік Маскоўскага т-ра для дзяцей (у 1936 Цэнтр. дзіцячы т-р). У 1937—42 рэпрэсіравана. З 1943 у Алма-Аце, дзе стварыла Першы казахскі т-р для дзяцей і юнацтва. З 1958 у Маскве, гал. рэжысёр Усерас. гастрольнага т-ра, заг. дзіцячага аддзела Масэстрады. З 1964 узначальвала першы ў свеце Дзярж. дзіцячы муз. т-р у Маскве (адкрыты ў 1965; цяпер імя С.). Зрабіла вял. ўклад у развіццё дзіцячага т-ра і маст. выхавання дзяцей. Аўтар п'ес, лібрэта дзіцячых опер і балетаў, кніг і артыкулаў па пытаннях муз. выхавання. Дзярж прэмія СССР 1972. Ленінская прэмія 1982.

Тв.: Театр для детей. Л., 1925 (разам з С.Розанавым); Наш путь. М., 1932; Дети приходят в театр. М., 1961; Волшебные очки. М., 1965; Новеллы моей жизни. Кн. 1—2. 3 изд. М., 1985. *Л.А.Шымановіч.*

САЦ-АРТ, адна з найб. значных плыней сав. неафіц. мастацтва (андэграўнда). Узнік у 1970-я г. ў творчасці рас. мастакоў В.Комара і А.Меламіда як ідэйная і эстэт. рэакцыя на панаваўшы метад *сацыялістычнага рэалізму* (парадыйная назва «С.а.» — літаральна «сацыялістычнае мастацтва»). С.-а. імкнуўся да пазбаўлення мастацтва ад ідэалаг. стэрэатыпаў, іранічна выкарыстоўваў і гратэскна (часам эпатажна) перапрацоўваў сімвалы сав. дзяржаўнасці, лозунгі камуніст. агітацыі і інш. Стылістычна не афарміўся ў дакладна вызначаны кірунак, аб'ядноўваў розных па творчай манеры мастакоў (Б.Арлоў, Р.Брускін, А.Касалапаў, Р.Лебедзеў, Дз.Прыгаў, Л.Сокаў і інш.). Прадстаўнік С.-а. на Беларусі — А.Пушкін.

С.У.Пешын.

САЦІ́ (франц. sotie ад sot дурны), камедыйна-сатырычны жанр франц. т-ра 15—16 ст., варыянт *фарса*. Узнік на аснове сярэдневяковых парадыйна-блазнерскіх прадстаўленняў. У С. ўсе персанажы выступалі ў абліччы «дурняў» (да звычайнага блазнерскага касцюма дадавалі атрыбуты, што сімвалізавалі іх пэўны тып), якія алегарычна пазначалі розныя заганы грамадства. Ствараліся і разыгрываліся аматарскімі тэатр. т-вамі, з якіх найб. вядомы «Бестурботныя хлопцы» (Парыж). У канцы 16 ст. выкананне С., якія выкарыстоўваліся буржуазіяй як форма крытыкі каралеўскай і папскай улады, былі забаронены.

САЦІ́ (Satie) Эрык Альфрэд Леслі (17.5.1866, г. Анфлёр, Францыя — 1.7.1925), французскі кампазітар. Вучыўся ў Парыжскай кансерваторыі, у «Схола канторум» (1905—08). Паўплываў на эстэт. прынцыпы творчай групы «Шасцёрка», але пазней адышоў ад яе. У пач. 1920-х г. адзін са стваральнікаў Аркейскай школы (аб'яднанне маладых музыкантаў). Яго творчасці ўласцівы навізна, прастата, наўмысная экстравагантнасць, супярэчлівасць (адыграў значную ролю ў фарміраванні імпрэсіянізму, аднак пазней быў у апазіцыі да яго). Сярод твораў: сімф. драма са спевам «Сакрат» (1918), балеты, у т.л. «Парад» (у садружнасці з Ж.Както і П.Пікасо, 1917), «Эксцэнтрычная прыгажуня» (1920), аперэты, творы для аркестра, хору, фп. творы і інш.

САЦІ́Н (франц. satin атлас), баваўняная ці з хім. валокнаў тканіна, якая мае гладкі бліскучы правы бок. Выкарыстоўваюць для пашыву сукенак, мужчынскіх кашуль, бялізны і інш.

САЦІ́НАВА Валянціна Фёдараўна (н. 10.10.1932, г. Астрахань, Расія), бел. вучоны ў галіне педагогікі і мовазнаўства. Канд. пед. н. (1972), праф. (1993). Скончыла Ленінградскі пед. ін-т (1954). З 1970 у Брэсцкім ун-це (у 1971—92 заг. кафедры). Навук. працы па тэорыі методыкі выкладання замежных моў, праблемах псіхалінгвістыкі, развіцця лінгва-краіназнаўчай культуры і гуманіст. выхавання, самаадукацыі, адбору і арганізацыі навуч. матэрыялу.

Тв.: Вопросы психолингвистики и преподавание русского языка как иностранного. М., 1971 (у сааўт.); English for future teachers. Мн., 1985; Английский язык: Корректиный курс. Мн., 1991 (разам з А.К.Івановай); Опыт раннего обучения английскому языку (разам з А.Рыжовай) // Пачатковая адукацыя і выхаванне: прабл., пошукі, знаходкі. Брэст, 1998. Вып. 5; Читаем и говорим о Британии и британцах. 5 изд. Мн., 2000.

САЦКО́Ў Юрый Назаравіч (н. 1.1.1948, г. Шахцёрск Сахалінскай вобл., Расія), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1991), праф. (1994). Скончыў БДУ (1971). З 1972 у НДІ сродкаў аўтаматызацыі, з 1974 у Ін-це буд-ва і архітэктуры. З 1978 у Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН Беларусі (у 1994—95 нам. дырэктара, з 1999 заг. лабараторыі). Адначасова з 1999 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі. Навук. працы па тэорыі раскладаў, тэорыі графаў, сеткавым планаванні і кіраванні («Тэорыя раскладаў. Шматстадыйныя сістэмы», 1989, з В.С.Танаевым, В.А.Струсевічам; перавыд. 1994 на англ. мове). Распрацаваў метады даследавання ўстойлівасці аптымальных раскладаў і складанасці задач тэорыі раскладаў з фіксаванай колькасцю работ, адаптыўныя метады каляндарнага планавання. Чл. Амер. матэм. т-ва (1989). Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

Тв.: Математические модели и методы календарного планирования. Мн., 1994 (разам з В.А.Струсевічам, В.С.Танаевым). *М.П.Савік.*

САЦУНКЕ́ВІЧ Іван Лявонавіч (28.10.1904, в. Маконь Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл. — 18.4.1989), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падполля і партыз. руху на Міншчыне ў Вял. Айч. вайну. Скончыў БДУ (1931). З 1932 на кіруючай і выкладчыцкай рабоце ў Мінску, 1-ы сакратар Заслаўскага райкома, сакратар Мінскага абкома КП(б)Б. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 у тыле ворага на падп. рабоце: арганізатар і камісар партыз. атрада, сакратар Мінскага падп. міжрайкома, чл. Мінскага падп. абкома КП(б)Б. У 1946—53, нарком. міністр лёгкай прам-сці БССР, да 1965 на адказнай гасп. рабоце. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1947—51. Аўтар кн. «Суровая быль» (2-е выд. 1979).

САЦУНКЕ́ВІЧ Ігар Сяргеевіч (н. 3.12.1935, Мінск), бел. фізік-тэарэтык, адзін з пачынальнікаў даследаванняў па фізіцы нейтрына на Беларусі. Канд. фіз.-матэм. н. (1970). Скончыў БДУ (1958). З 1958 у Ін-це фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па фізіцы высокіх энергій і электраслабых узаемадзеяннях элементарных часціц. Прадказаў парушэнне СР-сіметрыі за кошт электрычных дыпольных момантаў элементарных часціц, фатонны распад Ω^0-гіперона і ўзмацненне эфектаў слабых узаемадзеянняў паблізу вузкіх рэзанансаў.

Тв.: Современное экспериментальное подтверждение специальной теории относительности. М., 1979; О слабоэлектромагнитной околорезонансной интерференции (разам з А.А.Панковым) // Ядерная физика. 1981. Т. 33, вып. 6. *А.І.Болсун.*

САЦУ́РА Мікалай Уладзіміравіч (н. 2.6.1952, в. Пагост Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. артыст эстрады. Засл. дз. маст. Беларусі (1997). Скончыў Гомельскае муз. вучылішча імя Н.Сакалоўскага (1971), Мінскі ін-т культуры (1987). Вучань *Я.Глебава*. З 1975 артыст і муз. кіраўнік вак.-інстр. ансамбля «*Сябры*». Музыцы ўласцівы фалькл. традыцыі. Аўтар песень «Раздолле» (словы С.Астравога), «Шлях да Беларусі» (словы Н.Гілевіча), «Сцежачка», «Дзева Марыя» (абедзве на словы А.Лягчылава), «Саперніца» (словы Г.Бураўкіна), «Перажывём», «Нашы песні — наша жыццё», «Чырвонае і белае» (усе на словы В.Кавальчука), «На каляды» (словы Л.Дранько-Майсюка), «Свет у вакне» (словы А.Папярэчнага), «Бабыль» (словы Л.Ашаніна). Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1984. *Л.В.Баравікоў.*

САЦЫЁНІКА, галіна грамадскіх навук; тэхналогія вызначэння тыпу асобы. Развіваецца з канца 1970-х г. на стыку псіхалогіі і сацыялогіі. Заснавальніца С. літоўскі сацыёлаг і эканаміст А.Аўгусцінавічутэ прапанавала практычнае выкарыстанне тэорыі псіхал. тыпаў швейц. псіхолага К.Г.*Юнга*, распрацавала тэорыі сацыёну (падзелу чалавецтва на 16 псіхал. тыпаў) і інтэртыпных адносін (сумяшчальнасці людзей розных псіхал. тыпаў). С. прагназуе развіццё сяброўскіх, сямейных і інш. узаемаадносін, дае практычныя рэкамендацыі па іх удасканальванні, па прафес. арыентацыі і псіхал. самакарэкціраванні асобы. Дасягненні С. выкарыстоўваюцца ў сістэмнай псіхафізіялогіі, сац. псіхалогіі, педагогіцы, псіхалогіях асобы і творчасці.

Літ.: Аугустинавичюте А. Соционика: Введение. СПб., 1998; Я е ж. Соционика: Психотипы. Тесты. М.; СПб., 1998.

САЦЫНІ́ЯНЕ, прыхільнікі *сацыніянства*.

САЦЫНІ́ЯНСТВА, антытрынітарны рэлігійна-філас. рух 16—17 ст., распаўсюджаны пераважна ў Польшчы і ВКЛ. Асн. палажэнні С. сфармуляваны ягo заснавальнікам Ф.*Соцынам*. Для С. характэрна далейшая рацыяналізацыя ідэй *антытрынітарыяў*: аднаўленне догмату аб Тройцы і боскай прыроды Хрыста, прызнанне прыярытэту розуму ў пытаннях веры. Адзінай крыніцай веравучэння сацыніяне лічылі Свяшчэннае пісанне. Яны сцвярджалі, што не існуе першароднага граху, адмаўлялі патрэбнасць збаўлення, абвяргалі кальвінісцкі догмат аб прадвызначэнні. Агульным цэнтрам С. быў г. Ракаў Сандармірскага ваяв. ў Польшчы (цяпер вёска ў Свентакшыскім ваяв.), на Беларусі — г. Навагрудак. Соцын і яго першыя паслядоўнікі (на Беларусі *Я.Ліцыній Намыслоўскі*, Я.Даманеўскі, М.Цвердахлеб, Ц.Кузьміч і інш.) — прадстаўнікі ранняга С. Тэарэтыкі позняга С. (2-я пал. 17 ст.) Я.Крэль, С.Пшыпкоўскі, А.Вішаваты і інш. патрабавалі верацярпімасці, аддзялення царквы ад дзяржавы, вял. ўвагу аддавалі развіццю асветы, прыродазнаўства і матэматыкі. У час *Контррэфармацыі* ў 1658—60 сацыніяне былі выгнаны з Рэчы Паспалітай і эмігравалі ў Германію, Англію і Галандыю. Ідэі С. распаўсюдзіліся ў некат. краіны Зах. Еўропы, паўплывалі на філас. погляды Б.Спінозы, Дж.Лока, англ. дэістаў. Філас. спадчына ідэолагаў С. была выдадзена ў 1665—68 у Амстэрдаме пад назвай «Бібліятэка польскіх братоў».

Літ.: Подокшин С.А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы. Мн., 1970; Я г о ж. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мн., 1990. *С.А.Падокшын.*

САЦЫЯБІЯЛО́ГІЯ, галіна навукі, якая выкарыстоўвае метады эвалюц. біялогіі ў аналізе сац. жыцця. Узнікла ў 2-й пал. 20 ст. пры вывучэнні паводзін жывёл і іх згуртаванняў. Асн. праблемы С. выкладзены амер. энтамолагам Э.Уілсанам у кн. «Сацыябіялогія. Новы сінтэз» (1975). Спрабуе тлумачыць паводзіны індывіда, зыходзячы з яго генет. праграмы.

З-за падабенства ў паводзінах жывёл і чалавека С. праводзіць прамую аналогію паміж імі. Лічаць, што паводзіны чалавека абумоўлены прыродным адборам і запраграмаваны генетычна; спрабуе ўводзіць у грамадскія навукі метады біял. навук, якія дазваляюць прадказваць паводзіны людзей; не адмаўляе таксама ролі навакольнага асяроддзя, навучання, культ. традыцый і генет. схільнасці індывіда.

САЦЫЯЛАГІ́ЗМ, метадалагічная і тэарэтычная пазіцыя ў сацыялогіі і сац. філасофіі, пры якой у тлумачэнні чалавека і яго асяроддзя першаступеннае значэнне надаецца сац. рэальнасці і сацыялагічным метадам. Развіваецца з канца 19 ст. як рэакцыя на натуралізм і псіхалагізм у грамадскіх навуках. Прынцыпы С. развівалі франц. сацыёлаг Э.*Дзюркгейм* і яго паслядоўнікі ў даследаваннях маралі, рэлігіі і навукі, каставага ладу (С.Бугле), этнічных працэсаў (М.Мос), права (Ж.Даві), эканомікі (Ф.Сіміян) і інш. У метадалагічным плане С. — прызнанне сацыялогіі асобнай, незалежнай навукай і імкненне тлумачыць розныя з'явы рэчаіснасці выключна сац. прычынамі, а часам абсалютызацыя ролі сацыялагічнага падыходу ў трактоўцы культ.-гіст. працэсу (гл. *Вульгарны сацыялагізм*). У анталагічным плане С. — сцвярджэнне аўтаномнасці сац. рэальнасці і яе перавагі над індывідамі.

САЦЫЯЛАГІ́ЧНАЕ ДАСЛЕ́ДАВАННЕ, сістэма паслядоўных метадалагічных, метадычных і арганізацыйна-тэхн. працэдур, накіраваных на атрыманне ведаў аб пэўных сац. з'явах і працэсах, тэндэнцыях і супярэчнасцях іх развіцця. Абумоўлена грамадскай патрэбнасцю ў новых сац. ведах, пазнанні грамадства, тэндэнцый развіцця сац. адносін, фактараў, якія ўплываюць на сац. з'явы, змены ўзаемаадносін паміж асобамі, сац. групамі і дзяржавай. Тэорыя С.д. накіравана на асэнсаванне сутнасці сац. аб'ектаў і сувязі паміж імі, тлумачэнне сац. з'яў і працэсаў. Метадалогію С.д. складаюць агульнанавук. сродкі пазнання сац. аб'ектаў і спецыфічныя метады, непасрэдна звязаныя з прадметам даследавання. Методыка С.д. — гэта сістэма аперацый, працэдур, прыёмаў вывучэння сац. аб'ектаў, іх сістэматызацыя і аналіз. Паводле складанасці і маштаб-

насці задач адрозніваюць С.д.: разведвальныя (пілатажныя, зандажныя) — пробныя, папярэднія даследаванні, якія праводзяцца з мэтай удакладнення элементаў асн. С.д.; апісальныя, накіраваныя на вывучэнне складаных, неаднародных па сваіх якасных і колькасных характарыстыках сац. аб'ектаў; аналітычныя — вывучэнне прычын, што абумовілі пэўны характар змен сац. аб'ектаў, вызначэнне і паглыблены аналіз яго асн. параметраў, уласцівасцей і функцый. Вылучаюць тэарэт. і эмпірычныя С.д. У межах тэарэтычнага С.д. распрацоўваюцца сацыялагічныя тэорыі, ажыццяўляецца тыпалагізацыя і класіфікацыя сацыялагічнай інфармацыі, выяўленне заканамернасцей, тэндэнцый і перспектыў развіцця пэўных сац. працэсаў і з'яў і сацыялагічнай навукі ўвогуле. Эмпірычнае С.д. вывучае і абагульняе сац. факты шляхам прамой ці ўскоснай рэгістрацыі. С.д. праводзіцца па распрацаванай праграме (сістэме тэарэт. і эмпірычных працэдур), якая складаецца з метадалагічнай і працэдурнай частак. Метадалагічная частка ўключае этапы вызначэння праблемы, аб'екта і прадмета С.д., характарыстыкі мэтаў і задач, удакладнення асн. паняццяў, папярэдняга апісання (сістэмнага аналізу) аб'екта даследавання, фармулявання гіпотэз. Працэдурная частка С.д. заключаецца ў распрацоўцы стратэгічнага плана даследавання, апісанні метадаў і тэхнікі збору сацыялагічных даных, сістэматызацыі і аналізе атрыманай інфармацыі. У С.д. выкарыстоўваецца шэраг спец. сацыялагічных метадаў. Найб. пашыраныя метады збору сацыялагічнай інфармацыі: *апытанне* (*анкетаванне* і *інтэрв'ю*), аналіз дакументаў (усебаковае даследаванне тэкставых дакументаў, дакладаў, пратаколаў, архіўных матэрыялаў і інш., абагульненне і сістэматызацыя атрыманых даных), кантэнт-аналіз (колькаснае вывучэнне зместу, сац. інфармацыі, найб. распаўсюджанае пры даследаваннях СМІ), *назіранне, эксперымент, мадэліраванне сацыяльнае, матэматычнае мадэліраванне*.

Літ.: Ядов В.А. Социологическое исследование: методология, программа, методы. Самара, 1995; Котляров И.В. Политическая социология. Мн., 1998; Бабосов Е.М. Социология. Мн., 1998; Тощенко Ж.М. Социология: Общий курс. 2 изд. М., 1999.

І.В.Катляроў.

САЦЫЯЛАГІ́ЧНАЯ ШКО́ЛА КРЫМІНА́ЛЬНАГА ПРА́ВА, кірунак у навуцы крымін. права. Узнікла ў канцы 19 — пач. 20 ст. Прадстаўнікі школы Ф.Ліст (Аўстрыя), Э.Феры (Італія), І.Я.Файнінцкі, С.В.Познышаў (Расія), прызнаючы сац. абумоўленасць злачынных паводзін чалавека, лічылі, што на яго ўплываюць і біял. (у т.л. спадчыннасць), фіз. (час года, клімат, час сутак і да т.п.) і інш. фактары. Сучасныя прыхільнікі школы прытрымліваюцца тэорыі і мноства фактараў злачыннасці як біял., так і сац. (напр., звязаных з урбанізацыяй). Крыміналісты-сацыёлагі лічылі, што навука крымін. права аб'ядноўвае крымін. права ў вузкім сэнсе (крымін. дагматыка), крыміналогію або этыялогію злачынстваў і крымін. палітыку (распрацоўка мер барацьбы са злачыннасцю); некаторыя з іх у яе склад уключалі таксама пеналогію (навуку аб выкананні пакарання).

САЦЫЯЛАГІ́ЧНАЯ ШКО́ЛА ПРА́ВА, адзін з кірункаў навукі права 20 ст. Прыхільнікі школы лічылі, што дзеючыя прававыя акты не заўсёды адэкватныя эканам. і сац. умовам. У гэтай сувязі яны надавалі вял. значэнне свабодзе судзейскага меркавання, г.зн. меншай звязанасці суда прававымі нормамі для аховы інтарэсаў асобы. Буйнейшым прадстаўніком С.ш.п. з'яўляецца амер. вучоны Р.Паўнд.

САЦЫЯ́Л-ДАРВІНІ́ЗМ, кірунак у грамадазнаўстве канца 19 — 1-й пал. 20 ст., які ўзнік пад уплывам тэорыі Ч.*Дарвіна* і абвясціў заканамернасці біял. эвалюцыі і прынцыпы натуральнага адбору вызначальнымі фактарамі ў развіцці грамадства. Гл. *Дарвінізм сацыяльны*.

САЦЫЯ́Л-ДЭМАКРАТЫ́ЧНАЯ ПА́РТЫЯ А́ЎСТРЫІ (СДПА; Sozialdemokratische Partei Österreichs), адна з гал. паліт. партый краіны (належыць да левага кірунку). Засн. на мяжы 1888—89 як С.-д. рабочая партыя Аўстрыі. З 1896 прадстаўлена ў парламенце (з 1907 мела другую па колькасці фракцыю). З 1904 лідэры партыі Ф.*Адлер*, О.*Баўэр*, К.*Рэнер* і інш. распрацоўвалі канцэпцыю аўстрамарксізму (разнавіднасць *рэфармізму*). Пасля распаду Аўстра-Венгрыі (кастр. 1918) выступала за *аншлюс*, Рэнер узначальваў першы ўрад Аўстр. Рэспублікі. З 1920 у апазіцыі, процістаяла згортванню парламенцкай дэмакратыі ў краіне. Пасля паўстання свайго ваенізаванага *Шуцбунда* забаронена аўтарытарным урадам Э.Дольфуса (люты 1934). У крас. 1945 адноўлена як Сацыяліст. партыя Аўстрыі, з чэрв. 1991 сучасная назва. У 1945—66 удзельнічала ў фарміраванні ўрадаў вял. кааліцыі. Віцэ-канцлерамі Аўстрыі былі старшыні партыі А.*Шэрф* (1945—57) і Б.Пітэрман (1957—67). З 1966 партыя ў апазіцыі, пад старшынствам Б.*Крайскага* (1967—83) яна стала ў 1970 найб. моцнай паліт. сілай краіны. Федэральныя канцлеры Аўстрыі ад партыі — Крайскі (1970—83), Ф.Зінавац (1983—86), Ф.*Враніцкі*, (1986—97), В.Кліма (са студз. 1997). Найб. ўплыў партыя мае ў Вене, федэральных землях Карынтыя і Бургенланд.

Літ.: Миронов Д.А., Перцев А.В. Австромарксизм, позитивизм и рабочее движение. Свердловск, 1990.

САЦЫЯ́Л-ДЭМАКРАТЫ́ЧНАЯ ПА́РТЫЯ ГЕРМА́НІІ (СДПГ; ням. Sozialdemokratische Partei Deutschlands), адна з вядучых паліт. партый (належыць да левага кірунку) у ФРГ. Засн. ў 1869 В.*Лібкнехтам* і А.*Бебелем* на кангрэсе ў г. Айзенах (адсюль неафіц. назва членаў партыі — айзенахцы) як С.-д. рабочая партыя; ідэалогія — *марксізм*. У 1875 на з'ездзе ў г. Гота аб'ядналася з ласальянскім (гл. ў арт. Ф.*Ласаль*) Усеагульным герм. рабочым саюзам у адзіную Сацыяліст. рабочую партыю; з 1890 наз. Германская с.-д. партыя. У 1878—90 праследавалася ўладамі Герм. імперыі паводле *выключнага закону супраць сацыялістаў*. З 1890 прадстаўлена ў парламенце. У 1890—1913 старшынёй партыі быў Бебель, з 1913 — Ф.*Эберт*. У канцы 19 — пач. 20 ст. перайшла на пазіцыі *рэвізіянізму* і *рэфармізму*. Гэтыя ідэі распрацоўвалі Э.*Бернштэйн*, К.*Каўцкі* і інш. Уваходзіла ў 2-і Інтэрнацыянал. У 1917 з партыі вылучылася *Незалежная сацыял-дэмакратычная партыя Германіі*. Удзельнічала ў *Лістападаўскай рэвалюцыі 1918* у Германіі. Значна ўплывала на паліт. жыццё *Веймарскай рэспублікі*, сярод прэзідэнтаў якой ад партыі быў Эберт (1919—25), а канцлерамі — Г.Баўэр (1919—20), Г.*Мюлер* (1920, 1928—30). У 1933—45 забаронена нацыстамі; частка членаў партыі зняволена або загінула ў канцлагерах, іншая ч. дзейнічала ў эміграцыі (у 1933—37 у Празе, з 1938 у Парыжы, у 1940—45 у Лондане). Пасля 2-й сусв. вайны адноўлена пад сучаснай назвай (у зах. акупац. зонах Германіі пад старшынствам К.Шумахера), у сав. акупац. зоне ў 1946 на базе мясц. с.-д. арг-цый утворана *Сацыялістычная адзіная партыя Германіі*. У ФРГ (з 1990 аб'яднанай) у 1949—66 і 1982—98 апазіц. партыя, у 1966—82 утварала кааліцыйныя ўрады на чале з В.*Брантам* (1969—74) і Г.*Шмітам* (1974—82). Прынятыя ў 1959 і 1989 парт. праграмы (Бад-Годэсбергская і Берлінская) аформілі яе канцэпцыю дэмакр. сацыялізму. У кастр. 1998 урад ФРГ узначаліў сацыял-дэмакрат Г.*Шродэр* (з крас. 1999 старшыня партыі). Прэзідэнтам ФРГ ад партыі стаў у ліп. 1999 І.*Рау*. Друкаваны орган — час. «Neue Gesellschaft» («Новае грамадства»). Уваходзіць у Сацыяліст. інтэрнацыянал.

Літ.: Миллер С., Поттхоф Х. Краткая история СДПГ, 1848—1990: Пер. с нем. М., 1990; Брандт В. Демократический социализм: Ст. и речи: Пер. с нем. М., 1992.

Н.Г.Клюева.

САЦЫЯ́Л-ДЭМАКРАТЫ́ЧНАЯ ПА́РТЫЯ ДА́НІІ (СДПД; Danmarks Socialdemokratiske Parti), адна з вядучых партый краіны (належыць да левага кірунку). Засн. ў 1871 як секцыя 1-га Інтэрнацыянала, у 1872 распушчана дацкім урадам, у 1876 адноўлена як С.-д. саюз. З 1884 сучасная назва, парламенцкая партыя. Уваходзіла ў 2-і Інтэрнацыянал (з 1889). У 1924—42 (акрамя 1926—29), 1945, 1947—50, 1953—68, 1971—73, 1975—82 і з 1993 кіруючая партыя. Ідэалогія — *рэфармізм*. Сярод прэм'ер-міністраў Даніі ад партыі — яе лідэры Т.*Стаўнінг* (1924—26, 1929—42), Х.К.*Хансен* (1955—60), П.Н.*Расмусен* (з 1993). Уваходзіць у Сацыяліст. інтэрнацыянал.

Літ.: Тимашкова О.К. Скандинавская социал-демократия на современном этапе. М., 1978.

САЦЫЯ́Л-ДЭМАКРАТЫ́ЧНАЯ РАБО́ЧАЯ ПА́РТЫЯ ШВЕ́ЦЫІ (СДРПШ; Sveriges Socialdemokratiska Arbetarepartiet), вядучая паліт. партыя краіны (належыць да левага кірунку). Засн. ў 1889 у Стакгольме. З 1897 дзейнічала парт. праграма, прынятая на ўзор Эрфурцкай праграмы С.-д. партыі Германіі (на аснове *марксізму*). Да 1899 дамінавала рэв. група А.Данielьсана, потым вылучылася памяркоўнае крыло на чале з К.Я.*Брантынгам* (лідэр партыі з 1907; у 1920, 1921—23, 1924—25 прэм'ер-міністр Швецыі). З 1930-х г. ідэалогія — *рэфармізм* (шведскі сацыялізм), у знешняй палітыцы — нейтралітэт краіны. У 1932—76, 1982—91 і з 1994 кіруючая партыя (у час прэм'ерства Брантынга і ў 1925—26, 1991—94 ва ўрадавай кааліцыі з інш. партыямі). Іншыя прэм'ер-міністры Швецыі ад партыі: Р.Сандлер (1925—26), П.А.Хансан (1932—46), Т.*Эрландэр* (1946—69), С. У.*Пальме* (1969—76, 1982—86), І.Г.*Карлсан* (1986—91, 1994—96), К.*Більт* (1991—94), Г.Персан (з 1996). Друкаваны орган — газ. «Arbetet» («Рабочы»). Уваходзіць у Сацыялістычны інтэрнацыянал.

Літ.: Плевако Н.С. Швеция: реформизм против реформы.: К пробл. «экон. демократии» в 60—80-е гг. М., 1990.

САЦЫЯ́Л-ДЭМАКРА́ТЫЯ, сацыял-дэмакратызм, сукупнасць уяўленняў, поглядаў і дзеянняў, скіраваных на пабудову сацыяльна арыентаванага дэмакр. грамадства; плынь у міжнар. рабочым руху. Паводле прынятай у паліталогіі класіфікацыі належыць да левага кірунку (левага паліт. спектра). Для С.-д. характэрны: арыентацыя пераважна або выключна на эвалюц. формы грамадскага развіцця, на паступовае і мірнае пераўтварэнне капіталізму ў *сацыялізм* шляхам рэформ (гл. *Рэфармізм*), на супрацоўніцтва класаў грамадства і інш. Папярэднікамі ідэй С.-д. былі Ж.Ж.Л.*Блан*, П.Ж.*Прудон*. Негвалтоўныя метады С.-д. (кампраміс, пагадненне і інш.) вядомы з часоў дзейнасці Ф.*Ласаля*, *пасібілістаў* і інш. Развіццё ідэй С.-д. ішло ў бок трансфармацыі канцэпцый *марксізму* і *камунізму*. Афармілася ў 2-й пал. 19 ст., калі ўзніклі *Сацыял-дэмакратычная партыя Аўстрыі*, *Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі*, *Сацыял-дэмакратычная рабочая партыя Швецыі* і інш. У пач. 20 ст. засн. *Лейбарысцкая партыя Вялікабрытаніі*, у Расіі дзейнічалі *меншавікі*. У 1-ю сусв. вайну многія с.-д. партыі на хвалі патрыятызму падтрымлівалі ваен. палітыку ўрадаў сваіх краін. Сярод тэарэтыкаў С.-д. Э.*Бернштэйн*, К.*Каўцкі*, О.*Бауэр*, Ф.*Адлер*, Л.*Мартаў*, Л.*Блюм*, Э.*Вандэрвельдэ* і інш. (гл. таксама *Апартунізм*, *Рэвізіянізм*). Погляды С.-д. адстойвалі *Бернскі інтэрнацыянал*, *«Інтэрнацыянал 2 1/2»*, *Сацыялістычны рабочы інтэрнацыянал*, *Сацыялістычны інтэрнацыянал моладзі*, а з 1951 — *Сацыялістычны інтэрнацыянал*. У ходзе эвалюцыі с.-д. руху дамінуючае становішча ў ім занялі цэнтрысты (гл. *Цэнтрызм*). На працягу 20 ст. с.-д. партыі неаднаразова ўзначальвалі ўладу ў шэрагу краін, асабліва ў скандынаўскіх. На тэр. Беларусі дзейнічалі *Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы*, *Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя* і інш., у 1990-я г. створаны *Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада*, *Беларуская сацыялістычная партыя* і інш.

Літ.: Самарская Е.А. Социал-демократия в начале века. М., 1994; Миронов Д.А., Перцев А.В. Австромарксизм, позитивизм и рабочее движение. Свердловск, 1990; Салычев С.С. В поисках «третьего пути»: Эволюция идеологии социал-демократии в современ. эпоху. М., 1988.

У.Я.Калаткоў.

САЦЫЯ́Л-ДЭМАКРА́ТЫЯ КАРАЛЕ́ЎСТВА ПО́ЛЬСКАГА І ЛІТВЫ́ (СДКПіЛ; Socjaldemokracja Królestwa Polskiego i Litwy), сацыялістычная рабочая партыя ў Польшчы, на Беларусі і ў Літве ў 1893—1918. Узнікла пад назвай Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага (СДКП) у выніку аб'яднання *Саюза польскіх рабочых* і левых, інтэрнац. элементаў партыі «*Пралетарыят*» (2-і). У студз. 1900 на з'ездзе ў Мінску СДКП аб'ядналася з *Рабочым саюзам Літвы* ў адзіную СДКПіЛ. Стваральнікі і кіраўнікі: Б.Весалоўскі, Ф.*Дзяржынскі*, М.*Каспшак*, Р.*Люксембург*, Ю.*Мархлеўскі*, Я.*Тышка*, С.*Трусевіч*, Т.Уластоўскі і інш. Друкаваныя органы: газ. «Sprawa Robotnicza» «Рабочая справа», 1893—96), «Czerwony Sztandar» («Чырвоны сцяг», 1902—18) і інш.; час. «Przegląd Robotniczy» («Рабочы агляд», 1900—05), «Z pola walki» («З поля барацьбы», 1905). Асн. мэты — звяржэнне самадзяржаўя і заваяванне паліт. свабод, пабудова сацыялізму. У крас. 1906 уступіла ў РСДРП на правах аўт. арг-цыі. Адстойвала пазіцыі інтэрнацыяналізму ў рабочым руху. У рэвалюцыю 1905—07 адыгрывала кіруючую ролю ў студзеньска-лютаўскіх забастоўках 1905, *Лодзінскім паўстанні 1905*, падзеях *Кастрычніцкай усерасійскай палітычнай стачкі 1905*. У 1908 выступіла за захаванне і ўмацаванне нелегальных парт. арг-цый і максімальнае выкарыстанне магчымасцей для легальнай барацьбы. У 1916 СДКПіЛ пераадолела ўнутр. раскол (адбыўся ў 1911—12) на «зажандоўцаў» (прыхільнікаў Гал. праўлення) і «разломаўцаў», якія стварылі сваё Краявое праўленне і супрацоўнічалі з *бальшавікамі*. Падтрымала Лют. і Кастр. рэвалюцыі 1917. У 1917—18 групы СДКПіЛ дзейнічалі ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Маладзечна і інш. У снеж. 1918 разам з *ППС-лявіцай* утварыла *Камуністычную партыю Польшчы*.

Літ.: Бич М.О. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии в 1883—1903 гг. Мн., 1973; Cimek H. Komuniści a Polska (1918—1939). Warszawa, 1989.

САЦЫЯЛЕ́КТ, тое, што *сацыяльны дыялект*.

САЦЫЯЛІЗА́ЦЫЯ (ад лац. socialis грамадскі), працэс развіцця асобы — набыцця і засваення працоўных навыкаў, ведаў, норм, каштоўнасцей, традыцый, якія дазваляюць ёй функцыянаваць у якасці паўнапраўнага члена *грамадства*. Набыццё вопыту, авалоданне рознымі формамі і спосабамі дзейнасці ажыццяўляецца выхаваннем, адукацыяй і ўплывамі навакольнага асяроддзя. Сродкамі перадачы вопыту з'яўляюцца *мова* і апрадмечаныя вынікі чалавечай дзейнасці, у т.л. прылады працы. Асн. сферай, у якой адбываецца С. асобы, з'яўляюцца сям'я, выхаваўчыя і навуч. ўстановы, прац. калектывы, грамадскія арг-цыі і інш. Змест С. вызначаецца сац.-эканам. структурай грамадства, яе стадыі і канкрэтныя механізмы прымаюць пэўныя формы на кожным этапе гіст. развіцця соцыума. Працэс С. адбываецца больш паспяхова пры актыўным удзеле асобы ў творча-пераўтваральнай грамадскай дзейнасці. Найб. агульныя тэарэт. праблемы С. даследуе філасофія, розныя яе аспекты вывучаюць псіхалогія (механізмы дзейнасці і засваення вопыту), сац. псіхалогія (функцыі непасрэднага акружэння і міжасабовых адносін), сацыялогія (суадносіны працэсаў і ін-таў С. ў макрасістэме), гісторыя і этнаграфія (С. ў розных грамадствах і культурах), педагогіка (выхаванне). *М.В.Тараткевіч.*

САЦЫЯЛІ́ЗМ (франц. socialisme ад лац. socialis грамадскі), 1) сукупнасць ідэй, поглядаў, вучэнняў аб дасканалым грамадстве. 2) Кірунак ідэйна-паліт. і тэарэт. думкі, а таксама адпаведны ёй грамадскі рух. 3) Сацыяльны лад грамадства, які прадугледжвае пабудову і функцыянаванне ўсёй сістэмы грамадскіх адносін, грамадскай структуры і ін-таў, у т.л. дзяржавы, у адпаведнасці з сацыяліст. ідэямі. Тэрмін «С.» увёў у пач. 1830-х г. франц. сацыяліст-утапіст П.Леру. Прадстаўнікі *утапічнага сацыялізму* пад С. разумелі грамадскі лад без эксплуатацыі чалавека чалавекам, які заснаваны на прынцыпе грамадскай справядлівасці. У стараж. Грэцыі былі спробы філас. асэнсавання грамадскага і дзярж. ладу з пункту гледжання яго адпаведнасці патрэбам грамадзян. Лічылася, што чалавек павінен паважаць волю вышэйшых сіл, падпарадкоўвацца аб'ектыўным законам і ўплываць на прыродныя і грамадскія ўмовы ў інтарэсах свайго развіцця, а мэта дзяржавы — забеспячэнне самаст. і шчаслівага жыцця грамадзян. Ідэя справядлівасці і справядлівага грамадскага ладу складала аснову *звычаёвага права*. Сакрат абгрунтоўваў тоеснасць разумнага, справядлівага і законнага пачаткаў. Платон у дыялогу «Дзяржава» выклаў свой праект ідэальнай дзяржавы, выказваўся супраць прыватнай уласнасці і расколу грамадства на багатых і бедных, нераўнапраўя жанчын, захопніцкіх і грабежніцкіх войнаў. Арыстоцель вылучаў 2 віды справядлівасці: ураўняльную, якая грунтавалася б на «арыфметычнай роўнасці» людзей і выступала б у галіне

грамадзянскага і крымінальнага права; і размеркавальную, заснаваную на «геаметрычнай роўнасці», на падзеле агульных даброт па заслугах, прапарцыянальна асабістаму ўкладу кожнага. Развіццё сацыяліст. ідэй прадаўжалі прадстаўнікі утапічнага С. — Т.*Мор*, Т.*Кампанела*, Г.*Маблі*, Ж.*Мелье*, Ф.*Бабёф*, А.*Сен-Сімон*, Ш.*Фур'е*, Р.*Оўэн* і інш. З 16 ст. па 1830—40-я г. рабіліся спробы тэарэтычна абгрунтаваць шэраг асн. ідэй і палажэнняў: аб неабходнасці ўстанаўлення грамадскай уласнасці на прылады і сродкі вытв-сці, аб прынцыпе размеркавання грамадскіх даброт паводле здольнасцей, стварэнні буйной грамадскай вытв-сці з выкарыстаннем дасягненняў навукі і тэхнікі. Сфарміраваўся пэўны ідэал грамадскага ладу, дзе забяспечваюцца матэрыяльныя і духоўныя патрэбы грамадзян і ствараюцца ўмовы для ўсебаковага развіцця чалавечай асобы. Абвастрэнне класавых супярэчнасцей у капіталіст. грамадстве і паяўленне першых форм арганізаванага сац. пратэсту рабочых супраць эксплуатацыі, у прыватнасці чартысцкага руху ў Вялікабрытаніі, спрыялі ператварэнню С. ў 1830—40-я г. ў адзін з гал. кірункаў еўрап. грамадска-паліт. і навук. думкі, які звязваў сябе з абаронай інтарэсаў рабочага класа. Аднак сацыяліст. ідэі былі неаднародныя і супярэчлівыя ў разуменні будучага сацыяліст. ладу і шляхоў да яго ўсталявання. З цягам часу склаліся 2 гал. падыходы: марксісцкі і сацыял-дэмакратычны. Згодна з матэрыялістычным тлумачэннем гіст. працэсу (К.Маркс, Ф.Энгельс, У.І.Ленін і інш.), С. — заканамерны вынік гісторыі і з'яўляецца ніжэйшай ступенню камуніст. грамадска-эканам. фармацыі, якая прыходзіць на змену капіталізму. Асн. шляхам для дасягнення гэтай мэты лічыліся сацыяліст. рэвалюцыя, экспрапрыяцыя капіталу і буйной прыватнай уласнасці, пазбаўленне буржуазіі паліт. улады, уздым вытв. сіл грамадства на базе грамадскай уласнасці, удзел працоўных у кіраванні дзяржавай, развіццё асветы, навукі і культуры. Гэтыя прынцыпы ўвайшлі ў праграмы сацыяліст. арг-цый і партый марксісцкай арыентацыі. Сацыял-дэмакратычны падыход да С. ставіў задачы паступовага рэфармавання грамадства ў кірунку паляпшэння сац. становішча працоўных, пашырэння дэмакр. свабод і правоў грамадзян (гл. *Рэфармізм*). Гэтыя ідэі выкладзены ў праграмах адпаведных паліт. партый, якія ўваходзяць у *Сацыялістычны інтэрнацыянал*. Распад каланіяльнай сістэмы, утварэнне новых дзяржаў і пошук шляхоў самаст. развіцця выклікалі паяўленне своеасаблівых канцэпцый С., дзе знайшлі свой адбітак нац. традыцыі і культура пэўных народаў. Пераломнай для сацыяліст. ідэалу гіст. падзеяй стала *Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917*, дзякуючы якой С. пачаў набываць контуры рэальна існуючага грамадства ў Расіі, а пасля 2-й сусв. вайны — у некаторых краінах Усх. і Цэнтр. Еўропы, Кітаі, на Кубе. У СССР узнікла спецыфічная форма С. — дзяржаўны С., які спалучыў у сабе марксісцка-ленінскія ідэі з традыцыямі і культ.-цывілізацыйнымі асаблівасцямі рускага і іншых народаў краіны і характэрнымі рысамі якога былі: манаполія дзярж. уласнасці, адчужэнне непасрэдных вытворцаў ад сродкаў вытв-сці, прысваенне прыбавачнай вартасці і эксплуатацыя працоўных, дырэктыўнае цэнтралізаванае планаванне, нецярпімасць да іншадумства. Адначасова змест гэтай сістэмы выражаўся ў пэўнай сац. арыентацыі: грамадскія фонды, бясплатныя адукацыя і мед. абслугоўванне, датацыі, ільготы, бясплатнае атрыманне жылля і нізкая кватэрная плата, матэрыяльная падтрымка дзяржавай права на адпачынак і інш. Форма дзяржаўнага С. шмат у чым тлумачыцца складанымі ўнутр. і знешнімі ўмовамі (войны, пагрозы вайной і інш.), аднак былі забяспечаны цэласнасць шматнацыянальнай дзяржавы і яе ўсебаковае развіццё.

Літ.: Маркс К., Энгельс Ф. Маніфест камуністычнай партыі: Пер. з рус. Мн., 1968; Энгельс Ф. Развіццё сацыялізму ад утопіі да навукі: Пер. з рус. Мн., 1970; Утопический социализм: Хрестоматия. М., 1982; Бердяев Н.А. Истоки и смысл русского коммунизма. М., 1990; Бернштейн Э. Возможен ли научный социализм?: «Ответ Г.Плеханова»: Пер. с нем. М., 1991; Фроянов И.Я. Октябрь семнадцатого (глядя из настоящего). СПб., 1997; Жибуль И.Я. Гуманизм советского образа жизни. Мн., 1982. *В.І.Боўш.*

САЦЫЯЛІНГВІ́СТЫКА, сацыяльная лінгвістыка, навуковая дысцыпліна, у якой мова разглядаецца найперш як грамадская з'ява (у процілегласць падыходам прыродазнаўчым, гіст., псіхал.), як сацыяльна разгалінаваны сродак зносін людзей, што ў вял. ступені залежыць ад сац. стратыфікацыі саміх носьбітаў мовы (палажэнне ў грамадстве, характар заняткаў, адукаванасць, узрост, пол і інш.). Развіваецца на сумежжы *мовазнаўства, сацыялогіі, псіхалогіі сацыяльнай* і *этнаграфіі*. Распрацоўвае шырокі комплекс праблем сац. прыроды мовы, што раскрываецца ў грамадскіх функцыях розных моўных утварэнняў (этнамоў, *кайнэ, літаратурных моў, сацыяльных дыялектаў* і інш.), механізму ўздзеяння сац. фактараў на мову, дынамікі *двухмоўя* і *шматмоўя*, тыпалогіі моўных сітуацый, моўнай палітыкі дзяржавы, сувязей мовы і культуры і інш. На Беларусі вытокі сацыялінгвістычных даследаванняў у працах Я.Ф.Карскага і П.А.Бузука. Пытанні С. распрацоўвалі і распрацоўваюць А.І.Жураўскі, А.А.Лукашанец, В.У.Мартынаў, А.Я.Міхневіч, Н.Б.Мячкоўская, Б.Ю.Норман, А.Я.Супрун, П.П.Шуба, В.К.Шчэрбін і інш.

Літ.: Новое в лингвистике. Вып. 7. Социолингвистика. М., 1975; Лукашанец А.А., Михневич А.Е., Щербин В.К. Общество — язык — политика. Мн., 1988; Мечковская Н.Б. Социальная лингвистика. 2 изд. М., 2000. *А.Я.Міхневіч.*

САЦЫЯЛІ́СТЫ-РЭВАЛЮЦЫЯНЕ́РЫ, эсэры, палітычная партыя ў Расіі ў 1901—23. Узнікла ў канцы 1901 — пач. 1902 у выніку аб'яднання шэрагу народніцкіх груп і гурткоў. Кіраўнікі ў розны час: Р.А.*Гершуні*, В.М.*Чарноў*, Е.Ф.*Азеф*, Б.В.*Савінкаў*, А.Р.Гоц, М.В.Аўксенцьеў, У.М.Зензінаў. Друкаваныя органы: газ. «Революционная Россия», «Знамя труда», час. «Вестник русской революции» і інш. Асн. мэта — экспрапрыяцыя капіталіст. уласнасці, рэарганізацыя вытв-сці і ўсяго грамадскага ладу на сацыяліст. прынцыпах. Партыя прапаведавала тэорыю «адзінага працоўнага народа» (сяляне, рабочыя, рэв. інтэлігенцыя), якому павінна належаць улада і ўласнасць. Праграма (прынята на 1-м з'ездзе ў 1906) змяшчала патрабаванні дэмакр. рэспублікі, усеагульнага выбарчага права, свабоды слова, друку, сходаў, адукацыі за кошт дзяржавы, скасавання пастаяннай арміі. С.-р. лічылі сялянства гал. сілай рэвалюцыі, выступалі за сацыялізацыю зямлі (выключэнне яе з тавараабароту і ператварэнне з прыватнай уласнасці ва ўсенар. набытак), яе ўраўняльнае размеркаванне без выкупу, шырокае развіццё с.-г. кааперацыі. У нац. пытанні адстойвалі ідэю федэратыўных адносін паміж нацыянальнасцямі, прызнання за імі безумоўнага права на самавызначэнне. У рэвалюцыю 1905—07 С.-р. ўдзельнічалі ва ўзбр. выступленнях у Маскве (снеж. 1905), Кранштаце і Свеаборгу (лета 1906), кіравалі шматлікімі сял. паўстаннямі, мелі прадстаўнікоў у Дзярж. думе, Саветах рабочых дэпутатаў, ва Усерас. сял. саюзе. Але асн. сродкам барацьбы супраць самадзяржаўя яны лічылі індывід. тэрор. У 1901—12 эсэры ажыццявілі 200 тэрарыст. актаў, забілі 12 міністраў і 450 дзярж. служачых. У 1906 з партыі С.-р. вылучыліся групы, з якіх утварыліся партыі *максімалістаў* і *народных сацыялістаў*. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 эсэры легалізаваліся. Разам з *меншавікамі* яны падтрымлівалі палітыку Часовага ўрада (ад эсэраў у яго увайшлі А.Ф.*Керанскі*, Аўксенцьеў, Чарноў, С.Л.Маслаў). Іх прадстаўнікі фактычна панавалі ў Саветах сялянскіх дэпутатаў, разам з меншавікамі мелі большасць у Саветах рабочых і салдацкіх дэпутатаў, гар. думах, зямельных і харчовых к-тах. Летам 1917 з партыі С.-р. вылучылася фракцыя (са снеж. 1917 — самаст. партыя) *левых эсэраў*. С.-р. варожа сустрэлі *Кастрычніцкую рэвалюцыю 1917* (высунулі лозунг «Уся ўлада Устаноўчаму сходу!»). У час грамадз. вайны і ваен. інтэрвенцыі 1918—22 яны ўваходзілі ў склад *Камітэта членаў Устаноўчага сходу* і інш. антыбальшавіцкіх урадаў, арганізавалі шматлікія антыбальшавіцкія паўстанні, у т.л. *Антонава паўстанне 1920—21*. Да 1922 большасць арг-цый эсэраў разгромлены ВЧК (на эміграцыі яны праіснавалі да канца 1930-х г.), у чэрв. 1922 у Маскве адбыўся суд. працэс над 47 кіраўнікамі партыі. У сак. 1923 «Усерас. з'езд былых радавых членаў партыі эсэраў» прыняў рашэнне аб яе самароспуску.

На Беларусі гурткі С.-р. дзейнічалі з 1901. Вясной 1904 для каардынацыі іх

працы на тэр. бел. губерняў, а таксама Смаленшчыны і Браншчыны ўтвораны Паўн.-Зах. абл. к-т (гл. *Паўночна-Заходняя абласная арганізацыя партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў*). Паводле звестак 2-га з'езда эсэраў Паўн.-Зах. вобласці (кастр. 1906), у бел. губернях налічвалася 8863 чл. партыі. У 1905—07 С.-р. арганізавалі шэраг тэрарыст. актаў супраць мясц. царскіх чыноўнікаў. Найб. актыўнымі іх дзеячамі ў бел. губернях былі В.С.Балай, А.В.*Бонч-Асмалоўскі*, Е.М.Закрэўскі, А.А.*Ізмайловіч*, С.П.*Кавалік*, С.М.Малашчыцкі і інш. Пасля Люг. рэвалюцыі 1917 С.-р. сумесна з меншавікамі, бундаўцамі і польскімі сацыялістамі мелі большасць у мясц. Саветах і інш. установах. Паводле няпоўных звестак, на Беларусі летам 1917 дзейнічалі 22 эсэраўскія арг-цыі. У жн. 1917 на Зах. фронце налічвалася 32—33 тыс. членаў партыі. Восенню 1917 у сувязі з пераходам большасці членаў нізавых арг-цый С.-р. на бок бальшавікоў колькасць эсэраў на Зах. фронце скарацілася да 12 тыс. На выбарах ва *Устаноўчы сход* у бел. губернях і на Зах. фронце за партыю С.-р. прагаласавала 32,2% ад тых, хто галасаваў. Эсэры ўдзельнічалі ў рабоце Усебеларускага з'езда 1917, уваходзілі ў склад Нар. сакратарыята Беларусі і *Рады Беларускай Народнай Рэспублікі*. Аднак пры галасаванні 25.3.1918 3-й Устаўнай граматы, якая абвяшчала незалежнасць БНР, яны ўстрымаліся, а пасля падтрымкі часткай членаў Рады БНР вітальнай тэлеграмы герм. кайзеру Вільгельму II (25.4.1918) выйшлі з яе складу. Як і ў Расіі, эсэры ў Беларусі выступілі супраць *Брэсцкага міру 1918* і камбедаўскай палітыкі бальшавікоў, вялі ўзбр. барацьбу супраць сав. улады. У 1918 частка С.-р. перайшла тут ў *Беларускую партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў* (вылучылася з *Беларускай сацыялістычнай грамады*, самараспусцілася ў 1924).

Літ.: Гусев К.В. Партия эсеров: от мелкобуржуазного революционаризма к контрреволюции: Ист. очерк. М., 1975; Сташкевич Н.С. Приговор революции: Крушение антисов. движения в Белоруссии, 1917—1925. Мн., 1985; Бригадин П.И. Эсеры в Беларуси (конец XIX в. — февр. 1917 г.). Мн., 1994. *А.А. Вараб'ёў, У.Я.Казлякоў, Э.А.Ліпецкі.*

САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНАЕ СПАБО́РНІЦТВА, аб'ектыўныя адносіны, скіраваныя на дасягненне найлепшых вынікаў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Уласціва толькі сацыяліст. спосабу вытв-сці. Адной з першых форм С.с. былі камуніст. суботнікі (1919). З 1923 сталі праводзіцца вытв. нарады, якія ўключалі элементы С.с. Новым этапам С.с. ў гады 1-й пяцігодкі (1928/29—1932/33) стала ўдарніцтва. У час *індустрыялізацыі* ўдарныя брыгады сталі асн. формай С.с.

У крас. 1929 калектыў ленінградскага з-да «Чырвоны выбаржац» выступіў ініцыятарам С.с. ў агульнадзярж. маштабе. У маі 1930 узніклі грамадскія буксіры, мэтай якіх была дапамога перадавых калектываў адстаючым. У ліп. 1930 рабочыя Ленінградскага з-да імя К.Маркса распрацавалі сустрэчны прамфінплан, які стаў эфектыўным сродкам выяўлення рэзерваў вытв-сці. У маі 1931 на маш.-буд. з-дзе імя Леніна ў Ленінградзе ўзнікла першая госп.-разліковая брыгада. Значную ролю ў распаўсюджанні перадавога вопыту і павышэнні кваліфікацыі рабочых кадраў адыграў ізотаўскі і стаханаўскі рух.

У БССР С.с. разгарнулася вясной 1929. Першымі ў яго ўключыліся калектывы добрушскай папяровай ф-кі «Герой працы», віцебскага з-да «Чырвоны металіст», мінскіх металаапрацоўчых з-даў «Камунар» і «Энергія», гарбарных прадпрыемстваў Магілёва, Мінска, Віцебска, Гомеля і інш. У канцы 1929 у С.с. ўдзельнічала каля 15% рабочых буйной прам-сці Беларусі, у канцы 1930 — больш за 60%. Усяго да 1936 у розных формах С.с. ўдзельнічала 72,2% рабочых БССР. Масавы энтузіязм рабочага класа адыграў важную ролю ў вырашэнні задач індустрыялізацыі. Аднак з цягам часу С.с. пачало насаджацца парт. і прафс. органамі, набыло кампанейскі характар. У гады Вял. Айч. вайны спаборніцтва праходзіла пад лозунгам «Усё для фронту, усё для перамогі». За самаадданую працу многім беларусам было прысвоена званне Героя Сац. Працы. Ва ўмовах жорсткай цэнтралізацыі разгортвалася С.с. па аднаўленні разбуранай вайной нар. гаспадаркі. У кастр. 1958 калектыў дэпо Масква-Сартавальная прапанаваў разгарнуць спаборніцтва за камуніст. адносіны да працы. Калі ў цэлым у С.с. ў пач. 1970-х г. удзельнічала больш за 77 млн. чал., то ў руху за камуніст. адносіны да працы — каля 45 млн. чал. (на Беларусі адпаведна — 2854 тыс. і 1560 тыс.). Аднак на шляху многіх пачынанняў станавілася *адміністрацыйна-камандная сістэма*. Так, брыгадны падрад быў абмежаваны шматлікімі інструкцыямі і практычна страціў сваё эканам. значэнне. Не атрымала распаўсюджання і ініцыятыва Шчокінскага камбіната пад дэвізам «Менш работнікаў — больш прадукцыі». Актыўнасць працоўных стрымлівалася бюракратызмам, адсутнасцю эканам. метадаў кіравання, залежнасцю аб'яднанняў і прадпрыемстваў ад міністэрстваў. У выніку С.с. было пазбаўлена эканам. асновы, што патрабавала карэнных змен у яго арганізацыі. *А.М.Сасім.*

САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНАЯ АДЗІ́НАЯ ПА́РТЫЯ ГЕРМА́НІІ (САПГ; Sozialistische Einheitspartei Deutschlands), палітычная партыя левага кірунку, якая ў 1949—89 была кіруючай у *Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы* (ГДР). Засн. 21—22.4.1946 у Берліне (Усх.) на аб'яднаўчым з'ездзе Камуністычнай і С.-д. партый Германіі, якія дзейнічалі ў сав. акупац. зоне краіны, пад старшынствам В.*Піка* і О.*Гротэвала*. У 1948—50 пераўтворана ў кадравую партыю на ўзор КПСС. Яе праграма (мянялася некалькі разоў) прадугледжвала «пабудову антыфаш.-дэмакр. ладу ва ўсёй Германіі», асобы ням. шлях да сацыялізму, у т.л. праз прымусовую поўную калектывізацыю сельскай гаспадаркі (1960), утварэнне ў ГДР «сацыяліст. нацыі» (з 1963) і інш. Вышэйшы парт. орган — з'езд (з 1971 склікаўся раз у 5 гадоў), паміж з'ездамі — ЦК партыі (меў і права склікаць парт. канферэнцыі), які выбіраў Палітбюро і Сакратарыят на чале з ген. сакратаром (у 1953—76 наз. 1-ы сакратар; у 1950—71 В.*Ульбрыхт*, у 1971—89 Э.*Хонекер*, у кастр.—снеж. 1989 Э.Крэнц). Цэнтр. друкаваны орган — штодзённая газ. «Neues Deutschland» («Новая Германія»). У ходзе масавага руху за рэформы ў ГДР (восень 1989) перастала быць кіруючай (заканадаўча з 1.12.1989), страціла каля 95% сваіх членаў, пераўтворана ў САПГ — Партыю дэмакр. сацыялізму (паміж 8 і 17.12.1989), потым у Партыю дэмакр. сацыялізму (люты 1990), якая захавалася ў аб'яднанай Германіі (ФРГ).

Літ.: История Социалистической единой партии Германии: Очерк: Пер. с нем. М., 1980; Последний год ГДР. М., 1993.

М.Г.Жаркоў.

САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНАЯ ПА́РТЫЯ БЕ́ЛАЙ РУСІ́ (СПБР), студэнцкая паліт. арг-цыя на Гродзеншчыне ў 1904—05. Заснавальнікі і кіраўнікі Трускоўскі, М.Фальскі, А.Жаба. Выступала за звяржэнне самадзяржаўя і ўстанаўленне выбарнай нар. улады, заклікала моладзь не ісці ў армію, далучацца да нар. «бунту». Выдавала і распаўсюджвала лістоўкі на бел. мове («Царская гаспадарка», «Браццы мужыкі!», «Прызыўныя!» і інш.). Бел. сацыяліст. грамада вяла перагаворы пра аб'яднанне з СПБР, але яно не адбылося. *М.В.Біч.*

САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНАЯ САВЕ́ЦКАЯ РЭСПУ́БЛІКА ЛІТВЫ́ І БЕЛАРУ́СІ, гл. *Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка.*

САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНА́Л, міжнароднае аб'яднанне сацыяліст. і сацыял-дэмакр. партый рэфармісцкага кірунку (гл. *Рэфармізм*). Штабкватэра ў Лондане. Засн. ў 1951 на базе правасацыяліст. К-та міжнар. сацыяліст. канферэнцый (1947—51) як пераемнік *Сацыялістычнага рабочага інтэрнацыянала* (1923—40). С.і. прызнае толькі мірныя сродкі сац. дзеяння, выступае за паступовую трансфармацыю *капіталізму* ў *сацыялізм*, адмоўна ставіцца да *міжнароднага камуністычнага руху*. Аб'ядноўвае (2001) больш за 90 партый і арг-цый. Вышэйшы орган — кангрэс, які склікаецца 1 раз у 2—3 гады. Паміж кангрэсамі кіруе Бюро С.і., бягучую работу вядзе Сакратарыят. Старшыня С.і. — А.Гутэрыш (Партугалія).

САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНА́Л МО́ЛАДЗІ (СІМ), міжнародная маладзёжная арг-цыя сацыял-дэмакр. кірунку. Засн. на Міжнар. канферэнцыі сацыяліст. саюзаў моладзі (24—26.8.1907, г. Штутгарт, Германія), да 1912 аб'ядноўваў каля 170 тыс. чл. маладзёжных арг-цый 17 краін. У 1-ю сусв. вайну фактычна распаўся. Пад уп-

лывам Кастр. рэвалюцыі 1917 значная ч. арг-цый, што ўваходзілі ў СІМ, перайшла на камуніст. пазіцыі і ў ліст. 1919 засн. *Камуністычны інтэрнацыянал моладзі*. Адноўлены ў 1923 на міжнар. канферэнцыі ў г. Гамбург (Германія). Прымыкаў да *Сацыялістычнага рабочага інтэрнацыянала*, распаўся ў пач. 2-й сусв. вайны. Пераемнікам СІМ стаў засн. ў 1946 Міжнар. саюз маладых сацыялістаў.

САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНЫ РАБО́ЧЫ ІНТЭРНАЦЫЯНА́Л, міжнароднае аб'яднанне с.-д. партый ў 1923—40. Засн. на аб'яднаўчым кангрэсе *Бернскага інтэрнацыянала* і *Інтэрнацыянала 2 1/2* (май 1923, г. Гамбург, Германія). У сваёй дзейнасці кіраваўся ідэалаг. ўстаноўкамі і тэорыямі *рэфармізму* («арганізаваны капіталізм», «гаспадарчая дэмакратыя», «чыстая дэмакратыя» і інш.), адмоўна ставіўся да камуніст. руху і СССР. Спыніў існаванне ў пач. 2-й сусв. вайны, пасля таго як ням.-фаш. войскі акупіравалі г. *Брусель* (1940), дзе з 1935 знаходзілася штаб-кватэра С.р.і. Яго пераемнікам у наш час з'яўляецца *Сацыялістычны інтэрнацыянал* (засн. ў 1951).

САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНЫ РЭАЛІ́ЗМ, творчы метад літаратуры і мастацтва, эстэт. пастулаты якога грунтаваліся на сацыяліст. канцэпцыях светаўспрымання. У аснову маст.-выяўл. патрабаванняў былі пакладзены народнасць, гуманістычнасць, рамантыка, праўдзівасць гіст.-канкрэтнага адлюстравання рэчаіснасці ў яе эвалюц. развіцці. Генет. вытокі С.р. фіксуюцца ў рэв.-пралет. л-ры Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі (сярэдзіна — 2-я пал. 19 ст.), Расіі, Балгарыі, Польшчы, Украіны, Беларусі і інш. еўрап. краін (канец 19 — пач. 20 ст.). Тэрмін «С.р.» упершыню з'явіўся ў перыяд. друку ў 1932 і быў закліканы абазначыць маст. своеасаблівасць сав. л-ры, паняційна канкрэтызаваць іманентную сутнасць таго рэалізму, які пачаў дамінаваць у яе творчай практыцы. Існавалі варыянты азначальнай часткі тэрміна: «гераічны», «рамантычны», «рэвалюцыйны», «сацыяльны», «тэндэнцыйны», «манументальны» і г.д., але зацвердзіўся «сацыялістычны» як найб. універсальны. Паняцце С.р. замацавана на І Усесаюзным з'ездзе сав. пісьменнікаў (1934) для абазначэння асн. метаду сав. маст. літаратуры і літ. крытыкі. У статуце Саюза пісьменнікаў СССР, прынятым на гэтым з'ездзе, дэкларавалася, што С.р. павінен забяспечыць маст. творчасці «выключную магчымасць выяўлення творчай ініцыятывы, выбару разнастайных форм, стыляў, жанраў». Тэарэт. асновы С.р. закладваліся ў працах эстэтыкаў-марксістаў Г.Пляханава, Д.Благоева, А.Луначарскага, Ю.Мархлеўскага, В.Вароўскага, А.Варонскага і інш. Адным з буйнейшых пачынальнікаў лічыцца М.Горкі (раман «Маці»). На Беларусі актыўным прапагандыстам новага метаду быў Ц.Гартны. У 1918 у лекцыі пра бел. л-ру, прачытанай студэнтам Бел. нар. ун-та ў Маскве, ён сфармуляваў вядучыя прынцыпы пралет. творчай дактрыны, у аснову якой быў пакладзены класавы кампанент. На гэту дактрыну ў сваёй творчай практыцы арыентаваліся члены літ. аб'яднанняў «Маладняк», «Звенья», Бел. асацыяцыі пралет. пісьменнікаў, якія ўспрынялі заклік М.Горкага паказваць канфлікты сучаснай рэчаіснасці праз прызму гіст. аптымізму, адлюстроўваць іх у перспектыве грамадска-рэв. развіцця, малюючы велічны вобраз новага чалавека, стваральніка новага свету, рэалізатара спрадвечнай мары аб вольнай працы на вольнай зямлі. Аднак адразу быў узяты курс на ператварэнне С.р. з асноўнага ў адзіны для ўсіх творцаў маст. метад, а сац. аптымізм прадпісвалася разумець як лакіроўку рэчаіснасці. Неўзабаве з'явілася тэорыя бесканфліктнасці, якая выключала паказ сапраўдных грамадска-паліт. супярэчнасцей і недахопаў, дапускаючы адлюстраванне барацьбы, сутычак толькі добрага з лепшым, а лепшага з выдатным. Тэарэт. база С.р. пашыралася ідэямі народнасці (1930-я г.), сацыяліст. гуманізму (1950-я г.), прынцыпам эстэтычна адкрытай сістэмы (1970-я г.), што дазволіла стварыць шэраг высокамаст. твораў ва ўсіх жанрах л-ры (паэмы Я.Купалы, Я.Коласа, П.Броўкі, А.Куляшова, М.Танка і інш., раманы І.Мележа, І.Шамякіна, І.Навуменкі, І.Пташнікава і інш., п'есы К.Крапівы, А.Макаёнка і інш). С.р. — з'ява інтэрнацыянальная, яго прадстаўнікамі былі як савецкія (У.Маякоўскі, М.Шолахаў, К.Федзін, Л.Лявонаў, А.Фадзееў і інш.), так і зарубежныя (Л.Арагон, Г.Зэгерс, М.Пуйманава, Ж.Амаду, Я.Гашак і інш.) пісьменнікі. Метад С.р. быў пашыраны на ўсе віды мастацтва, у т.л. архітэктуру (пераважна аздабленне), выяўл. мастацтва, кіно, тэатр, музыку. Пасля распаду СССР С.р. не знік з творчай практыкі, але яго гіст. місія ацэньваецца даследчыкамі неадназначна.

Літ.: Ленин В.И. О литературе и искусстве. 7 изд. М., 1986; Марков Д.Ф. Проблемы теории социалистического реализма. 2 изд. М., 1978; Конан У.М. Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі (1917—1934 гг.). Мн., 1968; Гаранін Л.Я., Яскевіч А.С., Матрунёнак А.П. Нараджэнне новага мастацтва. Мн., 1980.

С.С.Лаўшук.

САЦЫЯЛО́ГІЯ (ад лац. societas грамадства + ...*логія*), навука пра грамадства, законы функцыянавання і развіцця сац. супольнасцей і працэсаў, пра сац. адносіны як механізмы ўзаемасувязі і ўзаемадзеяння паміж гэтымі супольнасцямі. Аб'ектам сацыялагічнага пазнання з'яўляецца *грамадства*, якое разглядаецца як адзіны сац. арганізм. Тэрмін «С.» ўвёў стваральнік гэтай навукі А.*Конт*, які сінтэзаваў найб. плённыя ідэі ў суцэльную праграму новай навукі пра грамадства, вылучыў у ёй *сацыяльную статыстыку* і сац. дынаміку. Паводле Конта, грамадства развіваецца па «законе трох стадый»: тэалагічнай, метафізічнай і пазітыўнай. Сістэматызаваны выклад прадмета, задач і праблематыкі С. ажыццявіў Г.*Спенсер*, які стварыў канцэпцыю сац. ін-таў як механізмаў самаарганізацыі сумеснага жыцця людзей. Канцэпцыя *сацыялагізму* найб. поўна адлюстравана ў працах Э.*Дзюркгейма*, які вызначаў прадмет С. як сац. факты, што існуюць па-за індывідам і ў адносінах да яго валодаюць прымусовай сілай. Імкненне знайсці аб'ектыўныя заканамернасці сац. з'яў абумовіла неабходнасць выкарыстання ў С. *статыстыкі*. М.*Вебер* вызначаў С. як навуку, якая вывучае *дзеянне сацыяльнае*, пры ўмове суб'ектыўнай матывацыі індывіда або групы. Паводле Вебера, асэнсаванае мэтарацыянальнае дзеянне — той ідэальны тып, узор сац. дзеяння, з якім суадносяцца іншыя тыпы. П.А.*Сарокін* развіў вучэнне пра «інтэгральную» С. і вылучыў 4 яе раздзелы: агульнае вучэнне пра грамадства, вывучэнне сац. заканамернасцей яго развіцця, вывучэнне асн. тэндэнцый у развіцці грамадства і грамадскіх ін-таў, сац. палітыка, задача якой — пошук сродкаў паляпшэння грамадскага жыцця.

Працэс фарміравання С. адзначаны пераходам ад гісторыка-эвалюцыйнага да структурна-аналіт. падыходу, тэарэт. пабудовы якога цесна звязаны з эмпірычнымі даследаваннямі. У межах агульнай праблематыкі фарміраваліся розныя тэарэт. арыентацыі ў адпаведнасці з пануючымі ў пэўны перыяд філас. плынямі. Так, «сацыялагізм» Дзюркгейма, які прапанаваў разглядаць факты «як рэчы», паралізіў лінію пазітывісцкага аб'ектывізму. «Разумеючая» С. Вебера (імкненне расшыфраваць унутраны сэнс сац. дзеянняў) абапіралася на ідэі *неакантыянства* і філасофіі жыцця. У 1950-х г. у С. існавала некалькі тэарэт. арыентацый, самая ўплывовая з іх — структурны функцыяналізм (Т.*Парсанс*, Р.К.*Мертан*), які ставіў на першы план прынцып цэласнасці і інтэграцыі сістэмы і тлумачыў прыватныя з'явы тымі функцыямі, якія яны выконваюць у межах гэтага цэлага.

На Беларусі сацыялагічная думка мае традыцыі, асновы якіх закладзены ў 19 ст., у т.л. ў працах К.Каліноўскага, Ф.Багушэвіча, А.Пашкевіч (Цёткі) і інш. У той час яна імкнулася да агульнатэарэт. пабудоў; з аднаго боку, зліваласа з сац. філасофіяй, з другога — з працамі этнагр. і дэмаграфічнага характару. Пасля стварэння АН Беларусі (1929) маштабы даследчай работы пашырыліся: вывучэнне сац.-эканам. і сацыякульт. праблем развіцця бел. нацыі (Я.Ф.Карскі, С.М.Некрашэвіч), дынамікі сац. структуры грамадства (У.М.Ігнатоўскі, М.В.Доўнар-Запольскі), С. сям'і і рэлігіі (С.Я.Вальфсон, Б.Э.Быхоўскі), асветы і выхавання (С.М.Васілейскі, А.А.Гайвароўскі, С.М.Рыверс). З канца 1930-х да сярэдзіны 1950-х г. гіст. падзеі надоўга вывелі айчынную С. па-за межы прыярытэтных навук. Аднак ускладненне сац. праблем, неабходнасць аналізу і прагназавання асн. тэндэнцый развіцця грамадства, вывучэння грамадскай думкі па актуальных пытаннях патрабавалі ўзнаўлення і развіцця С. З сярэдзіны 1960-х г. пачаўся новы этап развіцця даследаванняў па С. У 1965 засн. грамадскі Ін-т сацыялагічных дас-

ледаванняў; у 1968 у Ін-це філасофіі і права АН Беларусі створаны сектар (пазней аддзел) С., пры БДУ — Праблемная н.-д. лабараторыя сацыялагічных даследаванняў, у БПІ, ін-це нар. гаспадаркі і інш. ВНУ — сацыялагічныя лабараторыі. У 1989 засн. Рэсп. цэнтр сацыялагічных даследаванняў (з 1990 Ін-т С.), у БДУ — кафедра С. У 1990-я г. створаны недзярж. ін-ты і цэнтры сацыялагічнага профілю (Бел. сацыялагічная служба «Грамадская думка», Незалежны ін-т сац.-эканам. і паліт. даследаванняў, прыватнае даследчае прадпрыемства «НОВАК», Гомельскі сацыялагічны цэнтр «Аракул» і інш.). У 1996 створаны Ін-т сац.-паліт. даследаванняў пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Цэнтр сацыялагічных і паліт. даследаванняў БДУ. У наш час бел. сацыялагічная школа мае шэраг кірункаў: гісторыя і тэорыя С. (Г.П.Давідзюк, Я.М.Бабосаў, І.І.Антановіч, А.М.Елсукоў); С. асобы, распрацоўка тэорыі катастроф, С. канфліктаў (Бабосаў); С. трансфармацыйных працэсаў у грамадстве, С. моладзі (А.М.Данілаў); эканам. С. і С. працы (Г.М.Сакалова); С. сям'і (М.Р.Юркевіч, С.Д.Лапцёнак, С.Н.Бурава); С. навукі (Г.А.Несвятайлаў); С. культуры (Э.К.Дарашэвіч, В.І.Русецкая, Л.Р.Цітарэнка, С.В.Лапіна); С. адукацыі (А.І.Ляўко, В.А.Кліменка); паліт. С. (І.В.Катляроў, В.В.Бушчык); С. камунікацый (А.Ц.Манаеў); С. дэвіянтных паводзін (М.А.Бараноўскі); метадалогія сацыялагічных даследаванняў (С.А.Шавель, А.У.Рубанаў); методыка аператыўных даследаванняў (Д.Г.Ротман); распрацоўка асн. кірункаў дэмаграфічнай палітыкі краіны (А.А.Ракаў) і інш.

Літ.: Конт О. Курс положительной философии: Пер. с фр. Т. 1—2. СПб., 1899—1901; Спенсер Г. Основные начала: Пер. с англ. СПб., 1867; Дюркгейм Э. О разделении общественного труда: Метод социологии: Пер. с фр. М., 1996; Вебер М. Избр. произв: Пер. с нем. М., 1990; Сорокин П.А. Система социологии: Пер. с англ. Т. 1—2. М., 1993; Смелзер Н. Социология: Пер. с англ. М., 1994; Давидюк Г.П. Прикладная социология. Мн., 1979; Бабосов Е.М. Социология. Ч. 1. Общая социол. теория. Мн., 1998; Социология. Мн., 1998.

Г.М.Сакалова.

САЦЫЯЛО́ГІЯ АСО́БЫ, сацыялагічная тэорыя, якая разглядае *асобу* як сацыяльна тыповае адлюстраванне і індывідуальнае ўвасабленне пэўнай сістэмы грамадскіх адносін і адначасова як сацыяльна-тыповы суб'ект гэтых адносін. Прадмет С.а. — вывучэнне сац. гіст. і сац.-культурных тыпаў асобы, сац.-тыповых кампанентаў яе структуры і функцый, якія рэалізуюцца *індывідам*. С.а. зыходзіць з таго, што ў працэсе сац.-гіст. развіцця індывід вылучыўся з родаплемяннога супольнасці людзей раней, чым асоба. Адбылося гэта ў эпоху неалітычнай рэвалюцыі (8—7-е тыс. да н.э.), якая дала пачатак цывілізацыйнаму развіццю чалавецтва. Паліятыўны тып індывіда, які набываў некат. рысы асобы, склаўся пазней, прыкладна з канца 2-га тыс. да н.э. і да завяршэння таго перыяду, які К.Ясперс назваў «восевым часам» (8—2 ст. да н.э.). Сама ж асоба як сістэма сац. якасцей індывіда і суб'ект сац. дзейнасці пачынае праяўляцца спачатку ў антычнай культуры, потым у хрысціянстве. Гэты працэс завяршыўся ў эпоху Адраджэння і наступных за ёй бурж. рэвалюцый, на хвалі якіх узнікла індустр. цывілізацыя (цывілізацыя асобы). У межах гэтай цывілізацыі, паводле М.Вебера, асоба вылучаецца як самастваральны суб'ект актыўнай сац. дзейнасці. К.Маркс, З.Фрэйд, П.А.Сарокін, Т.Парсанс і інш. сацыёлагі ўстанавілі асн. кампаненты структуры асобы: самасвядомасць, самаацэнка, актыўнасць, інтарэсы, накіраванасць, перакананні, установкі, каштоўнасныя арыентацыі, ідэнтычнасць, сац. статус, сац. ролі, самарэалізацыя, самаразвіццё. Структура асобы ў асн. абумоўлена сістэмамі дзеяння, у якія яна ўключана. Паводле Парсанса, асн. функцыі асобы — адаптацыйная, арыентацыйная, пазнавальная, ацэначная, экспектацыйная, аксіялагічная, кантралюючая, стабілізуючая, варыяцыйная, матывацыйная, камунікатыўная і інш. Спецыфічнае для кожнай асобы ўзаемадзеянне гэтых функцый і структурных кампанентаў вызначае яе магчымасць выконваць розныя сац. ролі, у даследаванне якіх пэўны ўклад зрабіў Р.Лінтан, Дж.Мід, Р.Мертан, І.Гофман і інш. Вылучаюць наступныя сац. тыпы асобы: пасіянарны, мадальны, базісны, маргінальны, мафіёзны, аўтарытарны, дэмакратычны, рэактыўны, праактыўны і інш. Асобасная тыпалагізацыя і рэалізацыя сац. характарыстык розных тыпаў асобы мае практычнае значэнне пры фарміраванні асобы, а таксама ў штодзённым жыцці чалавека.

Літ.: Кон И.С. Социология личности. М., 1967; Парсонс Т. Система координат действия и общая теория систем действия: культура, личность и место социальных систем // Американская социологическая мысль: Тексты: Пер. с англ. М., 1996; Бабосов Е.М. Социология личности // Бабосов Е.М. Прикладная социология. Мн., 2000.

Я.М.Бабосаў.

САЦЫЯЛО́ГІЯ КУЛЬТУ́РЫ, галіна сацыялагічнай тэорыі, якая даследуе заканамернасці ўзаемадзеяння грамадства, асобы і *культуры*. Сутнасць, структурную пабудову, функцыі і тэндэнцыі развіцця культуры разглядае ў сувязі з дынамікай сац. структуры, развіццём сац. ін-таў, сац.-эканам., паліт. і духоўнымі зменамі ў грамадстве. Асн. кірункі даследаванняў С.к. — вызначэнне спецыфікі сац. тыпаў культуры (нар., нац., масавы і элітарны, субкультура і контркультура), іх функцый у грамадстве і асаблівасцей іх узаемадзеяння; характарыстыка функцыянавання культуры ў грамадстве як каштоўнасна-нарматыўнай сістэмы сімвалаў, ідэй, ведаў, узораў паводзін, якая рэгулюе жыццядзейнасць індывідаў і сац. суполак; вызначэнне ўзаемаўплываў культуры і тэхнал., экалагічных і інш. праблем чалавецтва. Тэрмін «С.к» ўведзены ў 1912 ням. сацыёлагам А.*Веберам*. Сацыялагічныя даследаванні культуры распачалі К.Маркс, Э.Дзюркгейм, Г.Зімель, вялі М.Вебер, П.А.Сарокін, Т.Парсанс, Р.Мертан, М.Мід, Л.Уайт і інш. Сарокін распрацаваў тэорыю сацыядынамікі культуры, згодна з якой найважн. падзеі ў працэсе гіст. развіцця абумоўлены зменай адной фундаментальнай формы культуры іншай. Парсанс вызначыў аб'ект С.к. як здольнасць культуры служыць у якасці дэтэрмінанты развіцця сац. сістэм, іх структуры і функцый. Мертан выявіў шматбаковую ўзаемасувязь сац. змен у грамадстве і дынамікі норм і каштоўнасцей культуры. На Беларусі даследаванні ў галіне С.к. канцэнтруюцца на праблемах сацыядынамікі культуры, яе развіцця ў кантэксце этнанац. і канфесіянальных асаблівасцей бел. грамадства (Э.К.Дарашэвіч, С.В.Лапіна, В.І.Русецкая і інш.).

Літ.: Сорокин П.А. Социокультурная динамика // Сорокин П.А. Человек. Цивилизация. Общество: Пер. с англ. М., 1990; Вебер А. К вопросу о социологии государства и культуры: Пер. с нем. // Культурология, XX в.: Антология. М., 1995; Ионин Л.Г. Социология культуры. М., 1996; Парсонс Т. Понятие общества: компоненты и их взаимоотношения // Американская социологическая мысль: Тексты: Пер. с англ. М., 1996.

Я.М.Бабосаў.

САЦЫЯЛО́ГІЯ ПРА́ЦЫ, сацыялагічная тэорыя, змест якой складаюць законы і катэгорыі, што вызначаюць *працу* як неабходную ўмову жыццядзейнасці індывіда і грамадства. Аб'ектам С.п. з'яўляецца праца як з'ява і як працэс у іх сац. накіраванасці на чалавека, які працуе. Прадмет С.п. — сац.-тыповыя працэсы, якія адлюстроўваюцца ў адносінах чалавека да працы, яго прац. актыўнасці. Тыповым для С.п. з'яўляецца аналіз установак і паводзін чалавека ў залежнасці ад зместу і характару працы. У працэсе навукова-тэхн. прагрэсу тэхніка і тэхналогія вытв-сці ўдасканальваюцца. Гэта выклікае змены прац. функцый чалавека, суадносін ручной, механізаванай і аўтаматызаванай, а таксама фіз. і разумовай працы, ускладненне яе арг-цыі. Якасныя зрухі ў змесце працы ствараюць перадумовы для змены яе характару, што ў сваю чаргу ўплывае на змест працы, запавольвае або садзейнічае яе развіццю. Закон адпаведнасці вытв. адносін узроўню развіцця прадукц. сіл (К.Маркс) праяўляецца ў сферы працы ў выглядзе закону адпаведнасці яе характару і зместу; з'яўляецца адным з асн. законаў С.п. і стварае катэгарыяльны апарат дадзенай тэорыі.

С.п. развівалася пад уздзеяннем праблем, звязаных са зменай спосабу вытв-сці і адпаведнай зменай прац. адносін. Яе законы функцыянавалі і да ўзнікнення С.п. як навукі. Напр., закон *падзелу працы* ўзнік у рабаўладальніцкім грамадстве, эвалюцыйна развіваўся ў перыяд феадалізму і рэвалюцыянізаваў у 1950-я г. на этапе навукова-тэхн. рэвалюцыі. У працэсе замены мануфактурнай вытв-сці

машыннай пачаў развівацца закон перамены працы, які рэвалюцыянізаваў амаль адначасова з законам падзелу працы. У капіталіст. вытв-сці пашырыў свае функцыі закон *канкурэнцыі* як асн. закон вытв-сці, які стымулюе развіццё законаў падзелу і перамены працы. З пачаткам фарміравання рыначнай сістэмы гаспадарання ў постсавецкіх грамадствах (1990-я г.) С.п. звязваецца з паводзінамі работадаўцаў і наёмных работнікаў у адказ на дзеянне эканам. і сац. стымулаў да працы. Асн. акцэнт робіцца на эканам. стымулы, якія рэгулююць прац. паводзіны сац.-прафес. груп. Большая ўвага аддаецца метадам аналізу і вырашэння прац. канфліктаў, сістэме сац. гарантый у сферы працы, сац. ін-там і механізмам сац. абароны работнікаў.

Літ.: Штольберг Р. Социология труда: Пер. с нем. М., 1982; Социология труда. М., 1993; Маркович Д.Ж. Социология труда: Пер. с сербскохорв. М., 1997; Адамчук В.В., Ромашов О.В., Сорокина М.Е. Экономика и социология труда. М., 1999; Ромашов О.В. Социология труда. М., 1999; Соколова Г.Н. Социология труда. Мн., 2000.

Г.М.Сакалова.

САЦЫЯЛО́ГІЯ ЭКАНАМІ́ЧНАЯ, сацыялагічная тэорыя, якая вывучае развіццё эканомікі як сац. працэс. Разглядае эканам. працэс як вынік дзейнасці сац. суб'ектаў у галінах вытв-сці, размеркавання, абмену і спажывання матэрыяльных даброт і паслуг. Даследуе ўзаемадзеянне 2 асн. сфер грамадскага жыцця — эканам. і сацыяльнай. Аб'ектам С.э. з'яўляюцца сац. механізмы, якія параджаюць і рэгулююць узаемасувязі паміж сац. і эканам. працэсамі. Катэгарыяльны апарат С.э. складаюць: найб. агульныя катэгорыі, якія адлюстроўваюць асн. характарыстыкі грамадскага ладу (эканам. сфера і эканам. адносіны); катэгорыі сац. механізма развіцця эканомікі і рэгулявання эканам. адносін; катэгорыі, якія канкрэтызуюць змест сац. механізмаў (эканам. свядомасць, эканам. мысленне, сац.-эканам. стэрэатыпы, эканам. інтарэсы, эканам. культура і інш.) і фарміруюць пэўны тып эканам. паводзін сац. суб'ектаў. С.э. грунтуецца на сац.-эканам. законах падзелу працы, перамены працы, канкурэнцыі і інш., якія вызначаюць развіццё сац. з'яў і працэсаў у сферах працы і эканам. жыцця грамадства. Зах. С.э. выходзіць па-за межы адзінага навук. кірунку і ахоплівае найб. актуальныя сац.-эканам. праблемы, вядома пад назвай «сацыялогія эканам. жыцця» (Н.Смелзер, Р.Сведберг, М.Гранавецер). На Беларусі С.э. сфарміравалася ў пач. 1990-х г. у сувязі з узнікненнем рыначнай сістэмы гаспадарання і неабходнасцю вывучэння сац. механізмаў рэгулявання попыту і прапаноў рабочай сілы на рынку працы і сац. вынікаў эканам. рэформ.

Літ.: Заславская Т.И., Рывкина Р.В. Социология экономической жизни: Очерки теории. Новосибирск, 1991; Смелзер Н. Социология: Пер. с англ. М.. 1994; Экономический образ мышления: Реальность и перспективы. Мн., 1994; Соколова Г.Н. Экономическая социология. 2 изд. М.; Мн., 2000; Социальные механизмы регулирования рынка рабочей силы. Мн., 1998; Рынок труда и механизмы его регулирования. Мн., 2001.

Г.М.Сакалова.

САЦЫЯЛ-РЭФАРМІ́ЗМ, тэорыя і практыка рэфармізму ў сацыяліст. і рабочым руху. Гл. ў арт. *Апартунізм, Рэфармізм, Рэвізіянізм.*

САЦЫЯЛ-ШАВІНІ́ЗМ, нацыяналістычная плынь, носьбіты якой выступаюць у падтрымку шавіністычнай (гл. *Шавінізм*) палітыкі правячых колаў сваіх краін. Актыўна С.-ш. праявіўся ў час 1-й сусв. вайны, калі большасць лідэраў сацыяліст. і с.-д. партый *Інтэрнацыянала 2-га* адмовілася ад прынцыпаў салідарнасці і падтрымала палітыку ўрадаў сваіх краін, якія ўдзельнічалі ў імперыяліст. вайне.

САЦЫЯЛЬНА-БЫТАВЫ́Я КА́ЗКІ, казкі, якія ў крытычна-завостранай форме адлюстроўваюць побыт і жыццё працоўных, узаемаадносіны ў грамадстве і сям'і, высмейваюць адмоўныя сац. тыпы і людскія недахопы, сцвярджаючы нар. ідэалы. У адрозненне ад *чарадзейных казак* у іх адсутнічаюць элементы фантастыкі. Героі С.-б.к. — бедны селянін, работнік, салдат, якія перамагаюць сваіх ворагаў-прыгнятальнікаў не звышнатуральнай сілай, а мудрасцю, кемлівасцю і знаходлівасцю. Найб. папулярнасцю карысталіся казкі на тэмы «мужык і пан», «мужык і поп(ксёндз)», дзе паны, папы і ксяндзы трапляюць у камічнае становішча, праз якое выразна выяўляюцца іх прагнасць, хцівасць, жорсткасць, дурасць («Пану навука», «Завідлівы поп»). У С.-б.к. 2-й пал. 19 ст. ярка адлюстравалася класавае расслаенне ў вёсцы ў паслярэформенны час. Канфлікт паміж беднымі і багатымі выразна раскрывае асн. рысы і якасці створаных народам вобразаў — бязлітаснага жорсткага багатыра і прыгнечанага абяздоленага бедняка. У некат. з гэтых казак вял. месца адведзена псіхал. характарыстыцы персанажаў. Адна з найважнейшых іх асаблівасцей адлюстравання рэчаіснасці — спалучэнне верагоднага паказу жыцця з карыкатурна-гратэскавай абмалёўкай адмоўных персанажаў. Для іх характэрна іронія, сарказм, гіпербала, дасціпны нар. гумар. Найб. развіццё С.-б.к. набылі ў эпоху феадалізму, актыўна бытавалі ў перыяд капіталізму, лепшыя ўзоры дайшлі да нашага часу.

Публ.: Сацыяльна-бытавыя казкі. Мн., 1976.

Літ.: Фядосік А.С. Беларуская сацыяльна-бытавая казка. Мн., 1995.

А.С.Фядосік.

САЦЫЯЛЬНАГА ПАРТНЁРСТВА ТЭО́РЫЯ, сацыяльна-эканамічная канцэпцыя ідэалаг. абгрунтавання ідэі пра неабходнасць супрацоўніцтва ўсіх сац. груп грамадства ў інтарэсах агульнага прагрэсу і дабрабыту. Набыла пашырэнне пасля 2-й сусв. вайны ў ФРГ, Аўстрыі, Швецыі, Францыі, Вялікабрытаніі, што звязана з асн. працэсамі эканам. і паліт. развіцця Зах. Еўропы. Ідэя класавага супрацоўніцтва сфармулявана ў працах Дж.*Міля*, Ж.Б.*Сея* і атрымала развіццё ў дактрыне *індустрыяльнага грамадства* (Дж.Голбрэйт, Ф.Перу, Р.Арон, Р.Дарэндорф і інш.). Паводле яе, класавыя канфлікты і барацьба перашкаджаюць грамадскаму інтарэсу і таму павінны саступіць месца сац. партнёрству. С.п.т. стала састаўной часткай распрацаванай Л.*Эрхардам* дактрыны зах.-герм. неалібералізму, якая прадугледжвала неабходнасць пераадолення класавых супярэчнасцей, мэтанакіраванага і планамернага развіцця ўсяго жыцця краіны з дапамогай метадаў дзярж. рэгулявання і планавання. Тэарэтычна абгрунтоўвалася і ў інш. краінах: як надыход эры «сацыяльнага праграмавання» (Бельгія), эпоха «пабудовы новага грамадства» з дапамогай «кантрактаў прагрэсу» (Францыя), эра «добраахвотнага супрацоўніцтва» (Вялікабрытанія) і г.д. Адзін з яе кірункаў — удзел працоўных у кіраўніцтве прадпрыемствамі і эканомікай краіны. На думку тэарэтыкаў лейбарызму і правай сацыял-дэмакратыі (Дж.Стрэйчы, Дж.Коўл, У.Пальме і інш.), паступовае ўкараненне сумеснага кіравання прадпрыемствамі наёмнымі работнікамі і прадпрымальнікамі прывядзе да стварэння грамадства новага тыпу — «дэмакратычнага сацыялізму».

Літ.: Гэлбрейт Дж. Новое индустриальное общество: Пер. с англ. М., 1969.

В.І.Боўш.

САЦЫЯ́ЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭ́ННЕ, сістэма забеспячэння і абслугоўвання састарэлых і непрацаздольных грамадзян, а таксама сем'яў, у якіх ёсць малыя дзеці. У Рэспубліцы Беларусь сістэма С.з. ўключае: *пенсіі*, дапамогі працуючым (па часовай непрацаздольнасці, з прычыны цяжарнасці і родаў і г.д.), мнагадзетным і адзінокім маці, малазабяспечаным сем'ям, дзе ёсць дзеці; санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне; утрыманне і абслугоўванне састарэлых і інвалідаў у спец. установах (дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў, дзяцей-інвалідаў і г.д.); пратэзаванне; прафес. навучанне і працаўладкаванне інвалідаў; ільготы інвалідам і мнагадзетным маці. Сродкі на С.з. засяроджаны ў Фондзе сац. абароны Мін-ва сац. абароны Беларусі, які не ўваходзіць у склад бюджэту краіны і фарміруецца за кошт узносаў наймальнікаў, страхавых узносаў асоб, што займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, абавязковых страхавых узносаў грамадзян і пэўных выдаткаў дзяржавы. Палажэнне аб Фондзе сац. абароны зацвярджаецца урадам. Памеры абавязковых страхавых узносаў у гэты фонд устанаўліваюцца законам. Сродкі фонду выкарыстоўваюцца толькі на мэтавае фінансаванне мерапрыемстваў па С.з. Гл. таксама *Сацыяльнае страхаванне.*

Г.А.Маслыка.

САЦЫЯ́ЛЬНАЕ ЗАКАНАДА́ЎСТВА, прававыя нормы, якія рэгулююць становішча работнікаў, што працуюць па найме, а таксама пытанні *сацыяльнага забеспячэння*. Нормы С.з. пашыраюцца на

прац. адносіны, якія грунтуюцца на прац. дагаворы паміж работнікам і наймальнікам незалежна ад віду і формы гаспадарання. Крыніцамі С.з. з'яўляюцца Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Кодэкс законаў аб працы, дэкрэты і ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і інш. акты прац. заканадаўства, *калектыўныя дагаворы*, пагадненні, інш. лакальныя нарматыўныя акты, прынятыя ў адпаведнасці з заканадаўствам, а таксама прац. дагаворы. У Канстытуцыю ўключаны шэраг артыкулаў, якія адносяцца да прац. і звязаных з імі адносін: права на працу, адпачынак, ахову здароўя, сац. страхаванне, сац. забеспячэнне і інш. Вял. значэнне маюць калектыўныя дагаворы, якія садзейнічаюць рэгуляванню прац. адносін і ўзгадненню сац.-эканам. інтарэсаў работнікаў і наймальнікаў на прадпрыемствах, ва ўстановах і арг-цыях, у іх падраздзяленнях, а таксама і ў прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць без стварэння юрыд. асобы. *Г.А.Маслыка.*

САЦЫЯ́ЛЬНАЕ ПРАДБА́ЧАННЕ, від *прадбачання навуковага*, накіраваны на прагназіраванне пэўных сац. з'яў і працэсаў. Служыць для ўдасканалення сац. праграм, планаў, кіраўніцкіх рашэнняў. Аб'ектам С.п. з'яўляюцца такія складаныя працэсы, як узаемадзеянне прыроды і грамадскай вытв-сці, развіццё навукі і адукацыі, эвалюцыя сац. адносін унутры пэўных сац. структур і інш. Гл. таксама *Прагназіраванне сацыяльнае.*

САЦЫЯ́ЛЬНАЕ СТРАХАВА́ННЕ, сістэма гарантый, заснаваная на сукупнасці *пенсій*, дапамог і інш. выплат грамадзянам за кошт сродкаў дзярж. страхавых фондаў. На Беларусі ажыццяўляецца на аснове Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Закона «Аб асновах дзярж. сац. страхавання» ад 31.1.1995 і інш. заканад. актаў. Прынцыпы дзярж. С.с.: удзел наёмных работнікаў і наймальнікаў у стварэнні дзярж. страхавых фондаў і размеркаванне сродкаў ад працаздольных грамадзян да непрацаздольных, ад працуючых да непрацуючых; гарантаванне пенсій, дапамог і інш. выплат у адпаведнасці з заканадаўствам; роўнасць грамадзян перад правам на С.с.; дыферэнцыяцыя ўмоў і памераў страхавання; удзел прадстаўнікоў юрыд. і фіз. асоб, якія плацяць страхавыя ўзносы, у кіраванні дзярж. С.с. Сродкі дзярж. С.с. складваюцца з абавязковых узносаў наймальнікаў і грамадзян, інш. паступленняў ў дзярж. страхавыя фонды, што захоўваюцца ў пазабюджэтных страхавых фондах (ствараюцца ўрадам). Гэтыя сродкі не падлягаюць выняццю, не абкладаюцца падаткамі і не могуць быць выкарыстаны на інш. мэты.

Абавязковаму дзярж. С.с. падлягаюць асобы, якія працуюць на аснове прац. дагавораў і членства ў кааператывах, прадпрыемствах і т-вах калект. форм уласнасці. Пры ўмове платы страхавых узносаў дзярж. С.с. пашыраецца на прадпрымальнікаў, работнікаў, якія працуюць на падрадзе, членаў сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак, творчых работнікаў, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, што працуюць у краіне. Выпадкі, пры якіх застрахаваныя грамадзяне маюць права на дзярж. С.с.: хвароба і часовая непрацаздольнасць, уключаючы цяжарнасць і роды; нараджэнне дзіцяці і догляд яго да 3 гадоў; дасягненне пенсіённага ўзросту; страта карміцеля; страта работы (беспрацоўе); вытв. траўмы і прафес. захворванні; смерць застрахаванага або члена яго сям'і. Наймальнікі маюць права за кошт уласных сродкаў ажыццяўляць дадатковае С.с. сваіх работнікаў. Грамадзяне могуць заключаць дагаворы на добраахвотнае С.с. Добраахвотнае і дадатковае С.с. можа ажыццяўляцца недзярж. страхавымі арг-цыямі ў адпаведнасці з заканадаўствам. Гл. таксама *Сацыяльнае забеспячэнне.* *Г.А.Маслыка.*

САЦЫЯ́ЛЬНА-ЭКАНАМІ́ЧНАЯ ГЕАГРА́ФІЯ, эканамічная і сацыяльная геаграфія, навука, якая вывучае тэр. арганізацыю грамадства, геагр. размяшчэнне і ўзаемасувязі аб'ектаў, працэсаў, з'яў у розных краінах, раёнах, мясцовасцях; частка грамадскай геаграфіі і сістэмы геагр. навук. Падзяляецца на шэраг дысцыплін, аб'яднаных у агульную С.-э.г. (паліт. геаграфія, тэарэт. геаграфія, гісторыя С.-э.г., *геаграфія сусветнай гаспадаркі*, эканам. картаграфія, методыка эканоміка-геагр. даследаванняў), галіновую С.-э.г. (*геаграфія насельніцтва, геаграфія прыродных рэсурсаў, геаграфія прамысловасці, геаграфія сельскай гаспадаркі, геаграфія транспарту* і інш.) і рэгіянальную С.-э.г. Аб'екты даследавання — насельніцтва, гаспадарка і яе галіны, прыродныя рэсурсы, прасторавыя формы ўзаемадзеяння насельніцтва, гаспадаркі і прыроднага асяроддзя — эканам. раёны, тэр.-вытв. комплексы, нас. пункты і інш. С.-э.г. даследуе іх у гіст. развіцці і функцыянаванні, у розных узроўнях — лакальным, рэгіянальным, нацыянальным, міжнацыянальным, глабальным. Выкарыстоўвае геагр. (напр., картаграфічны), эканам. і сацыялагічныя метады і падыходы. На Беларусі даследаванні ў галіне С.-э.г. праводзяцца ў БДУ, інш. ВНУ, часткова ў Нац. АН і праектна-даследчых установах.

Літ.: Саушкин Ю.Г. Экономическая география: история, теория, методы, практика. М., 1973; Сидор С.И. Социально-экономическая география СССР: наука и учеб. дисциплина. Мн., 1989; Жекулин В.С. Введение в географию. Л., 1989. *Г.С.Смалякоў.*

САЦЫЯ́ЛЬНАЯ МЕДЫЦЫ́НА, раздзел медыцыны, які вывучае стан здароўя грамадства. Даследуе ўмовы жыцця, вытв. адносіны, заканамернасці развіцця народанасельніцтва, дэмаграфічныя працэсы, а таксама неспрыяльны ўплыў сац. фактараў і ўмоў на здароўе насельніцтва. Выпрацоўвае навукова абгрунтаваныя рэкамендацыі па прадухіленні шкодных для здароўя насельніцтва сац. умоў. Гл. таксама *Сацыяльныя хваробы.* *Э.А.Вальчук.*

САЦЫЯ́ЛЬНАЯ СТАТЫ́СТЫКА, атрыманне, апрацоўка, аналіз і выкарыстанне сукупных звестак, якія характарызуюць колькасныя і якасныя заканамернасці сац. жыцця, сац. працэсаў і з'яў. Разглядае паліт., ідэалаг. і прававыя бакі жыцця людзей, жыццёвы ўзровень насельніцтва ў сац. разрэзе і па групах. Сістэма паказчыкаў С.с. характарызуе сац. ўпарадкаванне і структуру грамадства, колькасць і склад насельніцтва, спосабы і велічыню размеркавання даходаў паміж рознымі сац. групамі, наяўнасць і склад прац. рэсурсаў, узровень адукацыі, культуры, аховы здароўя, сац. забеспячэння, жыллёва-камунальныя і быт. ўмовы, умовы працы і адпачынку, выкарыстанне вольнага часу, стан і тэндэнцыі развіцця грамадскай думкі (гл. *Статыстыка*). Для атрымання сац. інфармацыі аб грамадскай свядомасці і праблемах яе развіцця ў С.с. выкарыстоўваюцца звесткі *сацыялагічных даследаванняў.*

САЦЫЯ́ЛЬНАЯ СТРАТЫФІКА́ЦЫЯ, дыферэнцыяцыя людзей, іх груп на сацыяльна няроўныя страты (слаі) у залежнасці ад узроўню даходаў, адукацыі, прафесіі, прэстыжу, удзелу ва ўладных структурах і інш. Дазваляе праводзіць адрозненне паміж тыпамі і формамі сац. няроўнасці, увасобленай у класавай, каставай, саслоўнай структуры грамадства. Тэрмін «С.с.» увёў П.А.*Сарокін*. Адметныя асаблівасці С.с.: дыферэнцыяцыя людзей у іерархічна афармленыя групы, г.зн. вышэйшыя, сярэднія і ніжэйшыя класы, слаі, страты грамадства; падзел людзей на прывілеяваную меншасць (знаць, багатыя, паліт. эліта і інш.) і ўшчэмленую ў якіхн. адносінах большасць (бедныя, што не маюць дачынення да ўладных структур і інш.). У працэсе жыццядзейнасці грамадства сац. страты ўвесь час мяняюцца і развіваюцца. У выніку ўзнікае *мабільнасць сацыяльная*, якая звязана са зменай індывідам ці групай месца ў сац. структуры грамадства, перамяшчэннем іх з аднаго сац. становішча ў іншае.

Літ.: Бабосов Е.М. Трансформация социальной структуры Беларуси в процессе становления ее государственности // Беларусь на шляху дэмакратызацыі. Мн., 1996; Гидденс Э. Стратификация и классовая структура // Гидденс Э. Социология: Пер. с англ. М., 1999; Сорокин П.А. Социальная стратификация // Сорокин П.А. Человек. Цивилизация. Общество. М., 1992.

Я.М.Бабосаў.

САЦЫЯ́ЛЬНЫ ДЫЯЛЕ́КТ, сацыялект, мова пэўнай сац. групы, што існуе ў межах агульнанар. мовы. С.д. былі мовай працоўна-прафес. груп (ганчароў, шаўцоў, рыбакоў, паляўнічых, шапавалаў і інш.), што калісьці адыгрывалі значную ролю ў гасп. укладзе грамадства. У наш час С.д. прадстаўлены мовамі прафес. карпарацый, часам арганізаваных фармальна (праз сімволіку, форму адзення і інш.): маракоў, чыгуначнікаў, ваенных, мастакоў, журналістаў, палітыкаў і інш. Узнікаюць і функцыянуюць як адметная рыса паводзін і зносін самых розных больш-менш акрэсленых сац. груп (секты, касты, аб'яднанні дэкласаваных элементаў, групоўкі фанатычных аматараў пэўнага

віду спорту, жанру музыкі, занятку). У С.д. замацоўваюцца асаблівасці дачыненняў і камунікавання такіх калектыўных соцыумаў, як спартсмены, навучэнцы, студэнты. Істотныя ўласцівасці С.д. (прадстаўлены ў кожным з іх не абавязкова з найб. паўнатой); адсутнасць, пераважна, сваёй граматыкі і фанетыкі (гэтым адрозніваюцца ад тэр. дыялектаў), спец. тэрміналагічная сістэма, якая выконвае жаргонаўтваральную функцыю. Лексічны склад С.д. і ўся сістэма жаргоннага камунікавання — сведчанне існавання і адноснай сац. значнасці пэўнага тыпу субкультуры. Узнікненне і функцыянаванне С.д. — адна з праяў працэсу бесперапыннага вар'іравання мовы ў сац. прасторы і гіст. часе (параўн. *арго, дыялект, ідыялект, нацыялект, храналект*).

Літ.: Бондалетов В.Д. Социальная лингвистика. М., 1987. *А.Я.Міхневіч.*

САЦЫЯ́ЛЬНЫЯ ХВАРО́БЫ, хваробы, узнікненне і развіццё якіх найб. залежыць ад уплыву неспрыяльных сац.-эканам. умоў і фактараў. Да развіцця С.х. прыводзяць псіха-эмацыянальныя хваляванні, стрэсы, незбалансаванае харчаванне, вытв. асяроддзе, сац.-эканам. нестабільнасць, паніжэнне ўзроўню жыцця насельніцтва. У выніку негатыўнага ўплыву сац. фактараў ствараецца фон для ўзнікнення С.х. Сац. значэнне туберкулёзу, венерычных хвароб, СНІДу, алкагалізму, наркаманіі, прафесійных хвароб і інш. звязана з пашыранасцю, цяжкасцю і працягласцю захворванняў, высокай рызыкай заражэння і інш. Зніжэнне захваральнасці на С.х. ў значнай ступені залежыць ад комплексу агульнадзярж. мер, накіраваных на фарміраванне здаровых умоў жыцця, працы, адпачынку насельніцтва, ахову навакольнага асяроддзя і інш.

Літ.: Социальная медицина и организация здравоохранения. Т. 1—2. СПб., М., 1998; Социальная гигиена (медицина) и организация здравоохранения. Казань, 2000.

Э.А.Вальчук.

САЦЫЯМЕ́ТРЫЯ (ад лац. societas грамадства + *...метрыя*), эмпірычны кірунак у сацыялогіі і сац. псіхалогіі, які вывучае эмацыянальныя міжасобасныя адносіны ў малых сац. групах; сукупнасць метадаў даследавання малых сац. груп. Тэрмін «С.» ўзнік у канцы 19 ст. ў сувязі са спробамі матэм. вымярэння сац. уплываў паміж людзьмі. Тэарэт. абгрунтаванне С. як метаду пазнання і вымярэння сац. з'яў прапанаваў амер. сац. псіхолаг і псіхіятр Я.Л.Марэна. С. даследуе структуру і дынаміку нефармальных адносін паміж індывідамі ў малых сац. групах, фармулюе заканамернасці эмацыянальных адносін у групах і экстрапалюе вывады на грамадства ўвогуле. Метады С. дазваляюць апісаць абагульненую карціну сімпатый і антыпатый у групе (сацыяграма), вызначыць нефармальных лідэраў і «адрынутых», самаацэнку стану асобы ў групе і інш. Атрыманыя шляхам матэм. разлікаў сацыяметрычныя каэфіцыенты адлюстроўваюць ступень згуртаванасці і ўзаемадзеяння індывідаў у групе.

Літ.: Морено Дж.Л. Социометрия: Эксперимент. метод и наука об обществе: Пер. с англ. М., 1958; Коломинский Я.Л. Психология взаимоотношений в малых группах. Мн., 1976; Антипина Г.С. Теоретико-методологические проблемы исследования малых социальных групп. Л., 1982.

Г.М.Сакалова.

САЧА́ВА Віктар Барысавіч (20.6.1905, пас. Паргалава Ленінградскай вобл., Расія — 29.12.1978), расійскі вучоны ў галіне геабатанікі і геаграфіі. Акад. АН СССР (1968). Скончыў Ленінградскі с.-г. ін-т (1924). З 1959 дырэктар Ін-та геаграфіі Сібіры і Д. Усходу Сіб. аддзялення АН СССР (Іркуцк). Навук. працы па геабатаніцы, класіфікацыі ландшафтаў і расліннасці, прыродным раянаванні, геасістэмах, метадах стацыянарных геагр. работ, праблемах вывучэння і асваення тайгі. Распрацаваў асноўныя тэарэт. палажэнні геабат. карціравання і класіфікацыі карт.

САЧАВІ́ЦА, сачыўка (Lens), род кветкавых раслін сям. бабовых. Каля 10 відаў. Пашыраны ў Міжземнамор'і, Зах. Азіі, Паўд. Еўропе. У культуры — С. харчовая, або звычайная (L. culinaris), вядомая з неаліту. Вырошчваецца ва ўсіх земляробчых раёнах, акрамя Аўстраліі і Паўн. Амерыкі. У Расіі — з 14 ст.

Сачавіца.

С. харчовая — аднагадовая травяністая расліна выш. 20—75 см. Сцёблы баразнаватыя, прамыя або ўзыходныя. Лісце складанае, парнаперыстае, з вусікамі. Кветкі белыя, ружовыя, фіялетавыя, у пазухах ліся. Плод — боб. Насенне мае да 35% бялку, каля 60% крухмалу, да 2,5% алею. Выкарыстоўваецца ў выт-сці бялковых прэпаратаў, каўбас, кансерваў, кандытарскіх вырабаў. Салома і мякіна — корм для жывёл. Харч., кармавая расліна.

В.М.Прохараў.

СА́ЧАК Міхаіл Рыгоравіч (н. 10.1.1929, в. Варонічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. вучоны ў галіне хірургіі. Д-р мед. н. (1976), праф. (1978). Засл. дз. нав. Беларусі (1981). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1955), з 1966 працуе ў ім (з 1979 рэктар, з 1996 заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях таракальнай хірургіі, праблемах рэактыўнасці арганізма пры пасляаперацыйных гнойных ускладненнях.

Тв.: Послеоперационные осложнения абдоминальной хирургии. Мн., 1986; Изолированная бифуркация трахеи. Мн., 1992 (разам з У.П.Харчанкам, У.У.Анічкіным).

Б.І.Сачанка.

СА́ЧАНКА Барыс Іванавіч (15.5.1936, в. Вялікі Бор Хойніцкага р-на Гомельскай вобл. — 5.7.1995), бел. пісьменнік. Брат І.І.*Сачанкі*. У 1943 з бацькамі вывезены ў Германію. Скончыў БДУ (1960). Працаваў у час. «Полымя», сакратаром Саюза бел. пісьменнікаў, у выд-ве «Мастацкая літаратура». У 1993—95 гал. рэдактар выд-ва «Беларуская Энцыклапедыя». Друкаваўся з 1956. Першы зб. прозы «Дарога ішла праз лес» (1960). Чалавек на вайне, жыццё вёскі, маральна-этычныя дачыненні людзей — тэмы ранняй творчасці. Гіст. мінулае палескага краю раскрыта ў аповесцях «Варэйка Золата» (1964), «Англіцкая сталь» (1966), «Дыярыуш Мацея Белановіча» (1976). Пра Вял. Айч. вайну аповесці «Палон» (1962), «Пакуль не развіднела» (1965), «Апошнія і першыя» (1966), «Аксана» (1968), раман «Чужое неба» (1975). У трылогіі «Вялікі лес» (1979—83) асэнсаванне прац. і ратнага подзвігу народа ва ўмовах акупацыі. Тэма Чарнобыля ў «Запісках аб радыяцыі» (нап. 1986—90), аповесцях «Родны кут» і «Еўка» (1987). У творах «Не на той вуліцы» (1974) і «Запіскі Занядбайлы» (1977), «Без пяці мінут «прахвесар» (1983) выкрываў мяшчанства, прыстасавальніцтва, графаманства, розныя аспекты побыту гараджан. Дзярж. прэмія Беларусі імя Я.Коласа 1982 за кн. прозы «Ваўчыца з Чортавай Ямы» (1978), Літ. прэмія імя І.П.Мележа 1991 за кн. крытыкі і публіцыстыкі «Сняцца сны аб Беларусі...» (1990). Апублікаваў са сваімі каментарыямі малавядомыя або невядомыя творы Я.Купалы, Я.Коласа, В.Ластоўскага, К.Свяжка, Л.Геніюш, У.Жылкі, А.Салаўя і інш. Склаў зб. паэзіі бел. эміграцыі «Туга па Радзіме» (1992), кн. ўспамінаў «На суд гісторыі» (1994) і інш. На бел. мову пераклаў аповесць Я.Гуцалы «Школь-

ны хлеб», П.Андрэева (П.Абрасімава) «Аповесць пра майго сябра», кн. апавяданняў і аповесцей І.Андрыча «Трывожны год», п'есы А.Салынскага, А.Галіна і інш.

Тв.: Выбр. тв. Т. 1—2. Мн., 1981; Выбр. тв. Т. 1—3. Мн., 1993—95; Беларуская эміграцыя. 2 выд. Мн., 1991; Трэцяе вока. Мн., 1992.

Літ.: Савік Л.С. Пад мірным небам бацькаўшчыны. Мн., 1986. *Л.С.Савік.*

САЧАНКА Іван Іванавіч (н. 8.11.1938, в. Вялікі Бор Хойніцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. гісторык, публіцыст. Брат Б.І.*Сачанкі*. Д-р гіст. н. (1983), праф. (1984). У 1943 з бацькамі вывезены ў Германію. Скончыў БДУ (1965), дзе з 1970 працуе на ф-це журналістыкі (з 1978 нам. дэкана, адначасова з 1984 заг. кафедры). Даследуе публіцыстыку бел. пісьменнікаў. Адзін з аўтараў падручніка «Гісторыя беларускай журналістыкі» (1979, з Р.В.Булацкім, С.В.Говіным), адзін са складальнікаў «Хрэстаматыі па гісторыі беларускай савецкай публіцыстыкі» (1974, з Булацкім).

Тв.: Кузьма Чорны — публіцыст. Мн., 1972 (разам з Р.В.Булацкім); Хто такія беларускія «патрыёты»? Мн., 1975; Публіцыстыка беларускіх пісьменнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Мн., 1977; Война и публицистика. Мн., 1980; Меридианы дружбы. Мн., 1992 (разам з А.В.Шарапам).

САЧКО́ Мікалай Сідаравіч (н. 17.2.1921, в. Мядзведзеўка Джанкойскага р-на, Крым, Украіна), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1965), праф. (1966). Засл. эканаміст Беларусі (1980). Скончыў Усесаюзны ін-т сав. гандлю (1945). З 1966 у Бел. політэхн. акадэміі (у 1966—88 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах эканам. і сац. эфектыўнасці новай тэхнікі, тэхналогіі і арг-цыі прамысл. вытв-сці, удасканальванні планавання на прадпрыемствах, канцэнтрацыі вытв-сці ў прам-сці.

Тв.: Специализация и кооперирование промышленности. М., 1960 (у сааўт.); Концентрация производства в промышленности. М., 1968; Организация и оперативное планирование машиностроительного производства. Мн., 1977; Сроки внедрения новой техники и эффективность производства. М., 1978; Теоретические основы организации производства. Мн., 1997.

САЧНІ́, у беларусаў тоўстыя мучныя бліны з начынкай. Наз. таксама хапуны. Скаромныя С. начыняюць мясам, тварагом або яйкамі, посныя — яблыкамі, вішнямі, макам і інш. Часта С. пяклі ў дарогу, бралі з сабой у поле. Такія С. вядомы на Пн Віцебшчыны. На Ушаччыне, у некаторых раёнах Магілёўшчыны С. пякуць з хлебнага цеста, якое яшчэ не падышло, без начынкі (гл. *Скавароднік*).

САЧО́К Рыгор Іванавіч (н. 4.9.1939, в. Зазерка Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне геалогіі і геаграфіі. Д-р геагр. н. (1989). Скончыў БДУ (1960, 1970). У 1964—67 і 1978—90 у Ін-це геал. навук АН Беларусі, у 1970—78 у Бел. н.-д. геолагаразведачным ін-це. З 1990 у Ін-це праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі (заг. лабараторыі). Навук. працы па выкарыстанні колькасных і матэм. метадаў і камп'ютэрнага мадэліравання ў геал. і геагр. даследаваннях, сістэмна-структурнай метадалогіі аналізу ландшафтаў Беларусі.

Тв.: Пространственно-временная структура гидрометеорологического режима Белоруссии и прилегающих регионов. Мн., 1980; Математико-картографическое моделирование природных условий Белоруссии. Мн., 1984 (разам з Т.Ф.Цурковай); Ацэнка ўздзеянняў на навакольнае асяроддзе: Тэорыя, метадалогія, фармалізацыя. Мн., 1994 (разам з В.В.Калядой).

САЧЫ́ЎКА, род кветкавых раслін, тое, што *сачавіца*.

САЧЫ́ЎКІ, вёска ў Іванаўскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 13 км на ПнЗ ад г. Іванава, 135 км ад Брэста, 15 км ад чыг. ст. Янаў-Палескі. 350 ж., 138 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

САЧЫ́ЎКІ (*Carpodacus*), род птушак сям. юрковых атр. вераб'інападобных. 21 від. Пашыраны пераважна ў гарах Цэнтр. Азіі, 3 віды на ПнЗ Паўн. Амерыкі, 1 — у Еўропе. Жывуць у хмызняках і па ўзлесках. На Беларусі 1 від — С. звычайная (*C. erythrinus*), якая робіць пералёты да Індыі і Кітая.

Даўж. цела да 22 см, маса да 26 г. Самцы пераважна чырв., самкі буравата-шэрыя. Нясуць 3—6 яец. Кормяцца насеннем, ягадамі, зрэдку насякомымі. *Э.Р.Самусенка.*

Самец **сачыўкі** звычайнай.

САЧЫЎЛЯ́НЫ, вёска ў Гербелевіцкім с/с Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл., каля р. Пад'яварка. Цэнтр калгаса. За 17 км на Пд ад г. Дзятлава, 156 км ад Гродна, 30 км ад чыг. ст. Наваельня. 343 ж., 139 двароў (2001). Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

САЧЭ́ННЯ СІСТЭ́МА, сістэма аўтаматычнага кіравання, выхадны сігнал якой з пэўнай дакладнасцю ўзнаўляе ўваходны сігнал, што змяняецца па папярэдне невядомым законе. С.с. бываюць лінейныя і нелінейныя, неперарыўныя і дыскрэтныя.

У адрозненне ад інш. сістэм аўтаматыкі ўваходны пераўтваральнік С.с. вымярае разузгадненне паміж уваходным і выхадным сігналамі сістэмы (гл. *Дыскрымінатар*). Структурная схема С.с. ўключае прамы ланцуг уздзеянняў і гал. адмоўную адваротную сувязь. Бываюць С.с. адна- (з адным ланцугом адваротнай сувязі) і шматконтурныя (некалькі ланцугоў адваротнай сувязі). Для кампенсацыі асн. узбуральных уздзеянняў можа мець разамкнутыя контуры. Выкарыстоўваецца ў робататэхн. сістэмах, сістэмах вызначэння кардынат розных аб'ектаў, навядзення ракет, у радыёлакацыі для суправаджэння рухомых аб'ектаў і інш. Гл. таксама *Кіраванне* ў кібернетыцы.

На Беларусі С.с. распрацоўваюцца ў БДУ, Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі, БПА і інш.

Літ.: Ганэ В.А., Степанов В.Л. Расчет следящих систем. Мн., 1990. *В.А.Ганэ, М.П.Савік.*

«САЮДЗІС» (літ. Sąjūdis рух, хваляванне), масавы грамадска-паліт. рух у Літве за перабудову і за адраджэнне дзярж. суверэнітэту. Узнік у 1988 пад уплывам і на ўзор Нар. фронту Эстоніі (гл. ў арт. *Народны фронт*). Ініцыятыўная група па стварэнні «С.» (36 чал.) выбрана 3.6.1988 на сходзе літ. інтэлігенцыі ў АН Літвы ў Вільнюсе. Устаноўчы сход адбыўся 22—23.10.1988 у вільнюскім Палацы спорту (1021 дэлегат, прысутнічалі прадстаўнікі літ. дыяспары з Беларусі, Польшчы, ЗША і інш.). Першы старшыня — В.*Ландсбергіс*. На пачатку «С.» выступаў за гаспадарчы разлік, у хуткім часе ператварыўся ў нац.-вызв. рух (патрабаванні вярнуць нац. сімволіку, надаць літ. мове статус дзяржаўнай, змяніць сістэму адукацыі, ліквідаваць прывілеі партнаменклатуры і інш.). Сац. база — інтэлігенцыя, студэнты, ч. членаў Камуніст. партыі Літвы. Праводзіў масавыя негвалтоўныя грамадз. акцыі (мітынгі, маршы веласіпедыстаў, «жывыя ланцугі» і інш.). 24.2.1990 перамог на выбарах у літ. парламент (тады Вярх. Савет). Пад кіраўніцтвам «С.» літ. народ дамогся аднаўлення незалежнасці (1990—91). Пасля 1991 палітычна эвалюцыяніраваў у бок *кансерватызму*. Друкаваны орган — «Sąjūdžio žinios» («Весці Саюдзіса», з чэрв. 1988). Падтрымлівае кантакты са структурамі Бел. нар. фронту.

Літ.: Зинкявичюс З. Восточная Литва в прошлом и настоящем: Пер. с лит. Вильнюс, 1996. С. 336—352. *У.Я.Калаткоў.*

«САЮ́З», 1) серыя сав. (рас.) касм. караблёў (КК) аднаразовага выкарыстання для арбітальных палётаў вакол Зямлі; праграма іх распрацоўкі (з 1962) і запускаў (з 1966). Прызначаліся для вырашэння тэхн. і навук. задач у каляземнай касм. прасторы, дастаўкі экіпажаў (1—3 чал.) на борт арбітальных станцый і вяртання касманаўтаў на Зямлю; былі і беспілотныя мадыфікацыі. У 1967—81 на арбіты выведзены 40 «С.», у т.л. 2 беспілотныя. Маса запраўленага і ўкамплектаванага «С.» да 6,9 т, даўж. 7,2 м, дыяметр 2,7 м.

Аб'ём жылых адсекаў 10,45 м³. Плошча панэлей сонечных батарэй да 14 м². Працягласць аўтаномнага палёту да 30 сут, у складзе арбітальнага комплексу — да 180 сут. На арбіту выводзіцца аднайм. ракетай-носьбітам з касмадрома Байканур.

Складаецца з 3 адсекаў, якія злучаны паміж сабой і аддзяляюцца пры пасадцы: *спускальны апарат*, дзе знаходзіцца экіпаж у час старту, стыкоўкі, расстыкоўкі і пасадкі; арбітальны (бытавы) адсек са стыковачным агрэгатам; прыборна-агрэгатны адсек з рухальнай установай. На базе «С.» распрацаваны КК «С. Т» (запускі ў 1979—86) і «С. ТМ» (з 1986) для дастаўкі экіпажаў адпаведна на арбітальныя станцыі «*Салют*» і «*Мір*» і вяртання касманаўтаў на Зямлю. «С. ТМ» выкарыстоўваецца як карабель-выратавальнік для Міжнар. касм. станцыі. Запушчаны 15 «С. Т» і 32 «С. ТМ» (2000). На аснове «С.» створаны таксама грузавы трансп. КК «*Прагрэс*».

2) Сав. (рас.) 3-ступеньчатыя *ракеты-носьбіты* (РН) для вывядзення на калязмесныя арбіты пілатуемых і аўтам. касм. апаратаў. Стартавая маса (разам з КК)~310 т, макс. маса карыснага грузу ~7 т. Пры дапамозе РН «С.» з 1966 выводзіліся ў космас некаторыя ШСЗ серыі «*Космас*», цяпер выводзяцца КК «С.» і «Прагрэс». Запускаюцца з касмадрому *Байканур* і *Плясецк*. РН «С.» з дадатковай 4-й ступенню, якая выкарыстоўвалася з 1961 для запуску ў космас некаторых касм. апаратаў серый «*Венера*», «*Зонд*», «*Космас*», «*Маланка*», «*Марс*», «*Месяц*», «*Прагноз*», называлася РН «Маланка». *У.С.Ларыёнаў.*



Касмічны карабель «**Саюз**»: 1 — стыковачны агрэгат; 2 — арбітальны адсек; 3 — прыборна-агрэгатны адсек; 4 — спускальны апарат.

САЮ́З 17 КАСТРЫ́ЧНІКА, гл. ў арт. *Акцябрысты.*

«САЮ́З АБАРО́НЫ РАДЗІ́МЫ І СВАБО́ДЫ», падпольная афіцэрская арг-цыя ў Расіі ў 1918; мела на мэце скінуць сав. ўладу і ўстанавіць у краіне ваен. дыктатуру. Засн. ў Маскве ў сак. 1918, кіраўнік — Б.В.*Савінкаў*. Меў аддзяленні ў Казані, Яраслаўлі і інш. гарадах. Саюз фінансаваўся *Антантай*. Арышты яго членаў органамі ВЧК у маі 1918 сарвалі выступленні ў Маскве і Казані. Аднак у ліп. 1918 саюз узняў антысав. мяцяжы ў Яраслаўлі, Рыбінску, Мураме, Ялацьме. Пасля іх разгрому спыніў існаванне.

«САЮ́З АБАРО́НЫ ЎСТАНО́ЎЧАГА СХО́ДУ», падпольная антыбальшавіцкая арг-цыя ў Расіі ў канцы 1917 — пач. 1918. Створаны ў Петраградзе 23.11(6.12).1917 прадстаўнікамі правых эсэраў, нар. сацыялістаў, меншавікоў-абаронцаў і часткі канстытуцыйных дэмакратаў (кадэтаў); меў аддзяленні ў Маскве, Ноўгарадзе, Адэсе, Самары і інш. Мэта — выкарыстаць маючае быць 5(18).1.1918 адкрыццё *Устаноўчага сходу* для звяржэння ўлады бальшавікоў і аднаўлення дэмакр. ладу. Выдаваў «Известия Союза защиты Учредительного собрания», распаўсюджваў антыбальшавіцкія лістоўкі, арганізаваў 5—9 (18—22).1.1918 у Петраградзе і Маскве дэманстрацыі ў падтрымку Устаноўчага сходу (расстраляны ўладамі). Неўзабаве пасля разгону бальшавікамі Устаноўчага сходу [у ноч на 6(19).1.1918] «С.а.У.с.» спыніў існаванне.

САЮ́З АРХІТЭ́КТАРАЎ БЕЛАРУ́СІ, Беларускі саюз архітэктараў (БСА), добраахвотная грамадская творчая арг-цыя архітэктараў Беларусі. Асн. мэты: садзейнічанне дзярж. і грамадскім арг-цыям у праектаванні і будаве гарадоў і інш. населеных пунктаў, прамысловых, с.-г., жылых, грамадскіх, культ.-бытавых збудаванняў, павышэнне прафес. ўзроўню сваіх членаў. Створаны на 1-м з'ездзе архітэктараў Беларусі ў 1935 як С. а. Б. З 1999 наз. Бел. саюз архітэктараў. Наступныя з'езды адбыліся ў 1937, 1941, 1950, 1955, 1958, 1961, 1966, 1970, 1975, 1980, 1985, 1991, 1995, 1999. Старшыні праўлення: П.Амбражунас (1935—37), А.Брэгман (1937—41), А.П.Воінаў (1941—50), М.Томах (1950—55), Г.Парсаданаў (1955—58), Л.Мацкевіч (1958—61), В.Ладыгіна (1961—64), Э.Дзямідаў (1964—66), В.Аладаў (1966—70), Ю.Шпіт (1970—73), Ю.Грыгор'еў (1973—75), Я.Ліневіч (1975—77), І.Боўт (1977—80), Ю.Патапаў (1980—85), Я.Кавалеўскі (1985—99), з 1999 прэзідэнт БСА — А.Сцяпанаў. У БСА уваходзяць 6 абл. і шэраг пярвічных арг-цый НДІ, ВНУ, праектных арг-цый. Дзейнічае Рэсп. дом архітэктара (засн. ў 1953). У 1990-я г. БСА уваходзіў у *Саюз архітэктараў міжнародны*. З 1990-х г. з'яўляецца членам Міжнар. асацыяцыі саюзаў архітэктараў. На 2001 у БСА 1040 членаў.

Члены Беларускага саюза архітэктараў

1935. П.І.Амбражунас, С.А.Асрыеў, А.П.Брэгман, І.І.Валадзько, У.М.Вараксін, А.П.Воінаў, В.П.Ждановіч, В.І.Кандратовіч, З.К.Магілеўчык, Н.М.Макляцова, Н.Я.Трахтэнберг. 1936. В.М.Волчак, Я.І.Гурарый, В.І.Гусеў, У.П.Фёдараў. **1937**. Б.А.Барысаў, П.Я.Кузьменка, Л.П.Мацкевіч, Т.С.Страмцова, М.І.Томах. **1938**. І.Дз.Белагорцаў, М.Ф.Кудзінаў, А.Я.Кудравіцкі, Г.А.Парсаданаў. **1939**. М.І.Мельнік. **1941**. Г.У.Заборскі. **1942**. У.А.Кароль. **1944**. У.А.Афанасьеў. **1945**. С.Б.Баткоўскі. **1946**. В.І.Анікін, М.І.Бакланаў, Г.М.Бенядзіктаў, Л.Г.Гафо, М.В.Драздоў, І.К.Елісееў, М.С.Кацар, І.А.Люблінскі, І.М.Рудэнка, Л.А.Стукачоў, Я.Р.Шапіра, Н.А.-Э.Шпігельман, П.Х.Яброў. **1947**. М.Я.Гулько, М.Г.Дабужская, В.І.Зайцаў, І.В.Мядзведзеў, Г.І.Хайкін. **1948**. В.Я.Сахно. **1949**. Л.І.Анікіна, І.М.Вятрук, Н.А.Зельтэн, І.П.Раткоў, Л.Дз.Усава, У.А.Чантурыя. **1950**. А.І.Наканечны. **1951**. І.Е.Бачылаў, Э.М.Гальдштэйн, Я.К.Дзятлаў, Я.Л.Заслаўскі, М.Н.Ліўшыц, Г.В.Сысоеў, Г.І.Фадзеева. **1952**. А.Р.Духан, В.Б.Ладыгіна, З.І.Озерава, А.Э.Фрыдман. **1953**. Р.В.Андрэева, П.А.Громаў, Ф.-А.А.Захрэ, Э.П.Левіна, Л.М.Рымінскі. **1954**. Ш.І.Хінчын. **1955**. С.В.Бяляеў, А.І.Зысман, І.Д.Левін, С.С.Мусінскі, Э.О.Шуберт. **1956**. С.Г.Абязава, В.М.Аладаў, Р.Р.Бекельман, В.С.Бурлака, Л.А.Каджар, Н.Г.Калінічэнка, З.М.Леўцава, В.А.Літвінаў, Я.М.Маршак, Ю.П.Пурэцкі, І.Д.Спірын. **1957**. Я.Л.Барсукова, А.Ю.Данілава, В.А.Данілаў, А.У.Жалдакоў, А.Б.Маркар'ян, Л.М.Міронава, М.Г.Мызнікаў, В.М.Навумава, А.М.Навумаў, Б.М.Назаранка, І.М.Папова, В.І.Перадзерый, Г.М.Сінельнікава, В.П.Чарнышоў, В.П.Шыльнікоўская, Ю.В.Шпіт, С.М.Ярогава. **1958**. Р.М.Алімаў, М.М.Афанасьеў, Ю.І.Глінка, Э.К.Кузняцова, П.І.Лаўрэнка, А.В.Лысенка, Т.П.Пенязькова, І.І.Сянкевіч. **1959**. С.С.Атаеў, Л.П.Афанасьева, Р.Р.Будзько, Ю.М.Градаў, Ю.П.Грыгор'еў, Г.У.Губіш, А.М.Гуль, З.Л.Драздоўская, Л.А.Кітаева, В.П.Кудраўцава, І.М.Мазнічка, В.Б.Масальская, А.В.Сычова, Р.Дз.Шэліхава. **1960**. Ю.А.Булай, П.Р.Бяляеў, А.А.Воінаў, В.І.Герашчанка, Ф.М.Іванчанка, І.Т.Каробкін, В.М.Мальшаў, Н.М.Мароз, В.С.Марцьянаў, Л.М.Пагарэлаў, М.М.Пірагоў, Т.М.Пучкаева, Я.С.Райхман, Т.С.Сераброўская, І.А.Станілевіч, А.П.Старчай, Г.А.Трушнікава, І.С.Фрыдман. **1961**. Н.І.Аладава, А.А.Бельскі, Г.Я.Булдаў, У.Л.Бурмакін, Э.Р.Вішнеўская, Э.М.Дзямідаў, С.Р.Канавалаў, Дз.П.Кудраўцаў, Т.І.Кузьменка, У.Р.Лахоня, Я.Л.Ліневіч, І.І.Ляўко, А.І.Макараў, У.А.Мінькін, У.Э.Сакалоўскі, А.А.Сідзельнікаў, А.Ф.Ткачук, К.Г.Усцюгаў, Ф.У.Хайрулін, Я.А.Цюкаў, М.І.Чаркасава, А.І.Ярушын. **1962**. В.В.Бажко, М.З.Барсукоў, І.І.Боўт, У.М.Вараксін, К.П.Вернер, Л.Б.Гельфанд, І.І.Есьман, І.А.Іода, А.П.Каралькоў, А.Ц.Кучарэнка, Л.М.Левін, В.С.Марокін, С.Б.Неўмывакін, А.І.Патапава, Ю.Ф.Патапаў, І.А.Сагаловіч, У.А.Сакалоў, Ж.С.Сахарава, С.Дз.Філімонаў, І.І.Фралоў, В.Р.Чэпік, В.М.Шаўчэнка, Б.А.Юрцін. **1963**. Б.І.Аляксандраў, Л.У.Архангельская, В.А.Астаповіч, І.В.Байцова, І.М.Байцоў, Э.А.Бацян, У.І.Брэдзіс, Г.А.Бяганская, А.В.Гарбачоў, І.Р.Голубева, З.С.Даўгяла, В.М.Емяльянаў, І.А.Збароўскі, Ю.А.Іваноў, І.Я.Ідэльсон, А.І.Касякоў, В.В.Клімаў, С.С.Корчык, Р.М.Лесь, З.М.Леўчанка, Л.І.Мельнік, А.Р.Мельнікаў, А.Л.Муладжанава, Н.М.Нядзелька, Я.С.Панамарова, Л.І.Прыгунова, Н.В.Свебада, Л.С.Сідарава, А.К.Тэн. **1964**. А.В.Гедройц, П.Р.Жураў, А.Н.Занеўскі, М.С.Заржэцкі, Э.А.Зубялевіч, Л.П.Каленікава, Т.А.Каманіна, І.Я.Крывіцкі, Г.І.Ліёпа, А.Е.Літвінава, С.Г.Майсеева, А.Р.Назараў, Л.С.Патапаў, Т.А.Піпкіна, А.І.Расейкін, В.К.Сушчыц, І.П.Шпіт, Н.В.Яснагародская, Ф.Я.Яснагародскі. **1965**. Г.Р.Аляксеева, В.А.Бабашкін, А.А.Беразоўскі, С.Б.Гінзберг, У.Р.Зубкоў, Л.А.Кажарскі, Я.К.Казлоў, А.С.Карамышаў, П.П.Кракалёў, М.П.Кунько, А.Р.Марэніч, Р.Я.Меметаў, У.І.Начараў, К.У.Сакалова, М.Р.Сундукоў, В.І.Сярогіна, Л.М.Тамкоў, Л.І.Яршова. **1966**. Н.М.Афанасьева, Э.А.Афанасьева, В.І.Галеўка, У.М.Гапонаў, Г.Дз.Горына, Л.А.Есьман, Р.М.Заікін, Ю.І.Казакоў, Л.М.Кантаровіч, Я.Я.Клапер, В.Р.Конюхаў, А.Я.Красоўскі, В.М.Ласкавы, І.І.Некрашэвіч, Я.А.Папоў, С.Ф.Паўлаў, Л.М.Пятроўская, В.С.Саенка, М.М.Трыгубовіч, С.І.Федчанка, Т.М.Ханіна, Я.Р.Цвінгель, У.М.Шынкевіч, А.Б.Эльтэрман, В.В.Ягадніцкі. **1967**. Э.М.Арцёмчык, М.М.Бурдзін, І.А.Бярозкіна, А.А.Васільеў, В.В.Гараеў, Е.Г.Грыневіч, У.Р.Ісачанка, І.С.Квітко, К.С.Кракасевіч, А.Дз.Кудзіненка, П.Б.Лагуноўская, Ю.Р.Лысоў, У.П.Пушкін, Т.Г.Раманоўская, П.С.Рудзік, У.Л.Сарочкін, В.П.Сільноў, С.Дз.Стружкін, М.Ф.Ткачук, У.В.Трацэўскі, С.Я.Ульянава, І.Цямнова, У.І.Цямноў, В.І.Юрціна. **1968**. Р.Л.Арцёмчык, В.С.Бялянкін, В.Р.Галавачоў, А.І.Еўтушэнка, В.С.Жаўняк, У.М.Заграбельны, С.М.Замараеў, В.І.Комар, З.І.Конаш, Л.В.Маскалевіч, Г.Г.Меншыкаў, І.М.Міхайлава, А.І.Міхед, М.С.Навумаў, Я.А.Сап'янік, В.К.Сцепчанка, Г.А.Фядосенка, У.М.Чарназёмаў. **1969**. М.Т.Буй-

лова, В.Г.Бурдзіна, М.В.Бялоў, В.Ф.Дудзін, Ю.Н.Кішык, Л.С.Кліцунова, Н.С.Краўкова, І.А.Краюхіна, В.І.Круткене, Н.А.Крылова, Б.М.Ларчанка, Г.У.Ласкавая, А.М.Лебедзеў, А.Г.Лукомская, А.К.Мурашкевіч, Л.А.Нардштэйн, Б.С.Папоў, С.І.Пеўны, Л.М.Пятрова, В.Я.Савельеў, Л.Я.Сагалаў, Т.Т.Семянюк, І.П.Сітнікава, С.Л.Смірнова, С.М.Талкачоў, Ю.Н.Трахтэнберг, Х.А.Хасьянаў, Т.І.Чарняўская, В.Л.Чыстоўская. **1970**. Г.Э.Бруніес, Д.С.Воранаў, Г.М.Гвоздзік, В.П.Занкевіч, А.К.Зензін, Л.М.Зензіна, У.І.Ізяргін, І.Д.Кока, В.Г.Крусь, М.Б.Марцінкоўскі, А.І.Палякоў, А.П.Фядорчанка, К.К.Хачатранц, Ц.П.Ціваноў, В.М.Чарнатаў, Г.П.Чысцякоў. **1971**. Г.М.Бараноўская, Р.М.Бараноўскі, В.В.Быкаў, С.І.Васілевіч, У.Ц.Васільеў, Л.А.Вільчко, М.Ц.Гардзеенка, В.І.Грыгарышына, Т.Ф.Дворына, В.І.Кандраценка, В.М.Кашырын, Э.М.Кляўко, Г.А.Кнаўэр, Б.А.Кожыхаў, І.І.Корж, В.У.Крамарэнка, А.А.Ладкін, Я.Я.Ліневіч, Р.М.Махмутаў, Т.А.Перасадзька, М.І.Пракалей, Н.В.Равяка, Я.С.Смальгоўскі, А.В.Собалеў, У.М.Сухаросаў, Р.К.Ціхаў. **1972**. К.М.Аляксееў, Л.Л.Беразень, М.У.Бараксін, І.І.Васілевіч, А.М.Главінская, А.І.Грачышнікаў, Н.Р.Даўгіх, М.Ф.Жлоба, І.С.Зорын, Т.М.Казлова, А.П.Калініньш, В.Ц.Калюжны, А.М.Канстанціновіч, В.Г.Котаў, Р.І.Крывашэева, У.М.Крывашэеў, У.М.Кузьменка, К.В.Лабзоў, Л.М.Лісоўскі, У.Г.Малахаў, Ю.М.Малевіч, А.М.Маскалькова, У.Ю.Мельцэр, С.Л.Мяжэвіч, Л.І.Новаш, Г.А.Патаеў, В.Г.Путроў, А.А.Сабалеўскі, В.І.Сахно, А.А.Серапян, Ю.І.Сердзюкоў, А.А.Снадскі, В.І.Ткачоў, А.Р.Трафімчук, С.І.Усенка, Я.М.Фарбераў, А.К.Шабалін, В.Шубіна, А.Р.Шчэрба, А.А.Юркеўская, В.Р.Ягошын, Ю.В.Ягупаў. **1973**. Г.А.Аляксандрава, Я.Л.Барсукова, І.Ф.Брэгман, Л.Р.Брэль, М.І.Бялянкіна, І.І.Галушка, М.Г.Дзівакоў, Дз.І.Жураўлёва, Л.С.Краўчыня, У.А.Лагуноўскі, Г.С.Ларкін, Дз.М.Мохаў, А.Ф.Няўзораў, Ю.А.Павалій, У.А.Палівода, Г.Ф.Пальчэўская, Л.М.Сабалеўская, Г.М.Свяцкі, І.А.Сітнікава, А.І.Фрыдман, У.Дз.Часноў, В.М.Чыстая, М.П.Ягораў, Н.Г.Якушка, Л.І.Яршова, А.В.Яршоў. **1974**. М.-В.К.Астраменцкі, Г.І.Белікаў, А.А.Брэгман, М.К.Вінаградаў, Т.В.Габрусь, В.М.Гацілаў, Э.М.Георгіева, А.Г.Горб, В.У.Гразноў, І.С.Жураўлёў, Г.В.Занеўскі, П.К.Казакова, І.У.Кароль, Р.Э.Кнаўэр, С.П.Крывашэеў, В.М.Лапцэвіч, Р.Ф.Максіменка, Р.Р.Маскоў, А.Л.Муладжанава, У.А.Мякішаў, А.Л.Сахно, Г.Р.Тарасевіч, У.М.Тарноўскі, І.С.Фёдарава, Л.І.Хаюцін, А.Е.Цыкалаў, М.С.Шуміхін, У.І.Шчарбіна, А.І.Шышакін. **1975**. Ю.М.Абрамовіч, С.Г.Алейнікава, В.Б.Ангелаў, В.Ф.Ачайкін, Я.Г.Бранцаў, Л.В.Былінская, А.А.Ганчароў, І.А.Гапонаў, С.Я.Гафштэйн, Г.Г.Голубева, В.Ф.Давыдзёнак, Ю.Г.Дзяменцьеў, У.М.Еўдакімаў, У.С.Залеўскі, М.С.Іваноў, В.П.Іўлічаў, Я.М.Кавалеўскі, В.І.Карака, М.Т.Кляшторная, І.А.Кнаўэр, У.В.Крывашэеў, А.П.Кушч, Г.П.Латышаў, У.А.Лытаў, В.М.Малышкін, М.Ф.Малючэнка, В.Ф.Марозаў, В.Дз.Пак, А.П.Панамароў, В.М.Папоў, А.А.Пецярбуржцаў, М.М.Пірагоў, Г.А.Ражкова, Л.А.Сазонава, Н.М.Сакалова, А.С.Сардараў, А.І.Сарокін, С.П.Сень, В.І.Фарафонава, Л.І.Чупіна, Ю.А.Шаравера, К.І.Эпштэйн, А.Ф.Юрын, М.І.Янчык, М.М.Яркоў. **1976**. В.П.Аганін, В.В.Арсеньеў, В.В.Баразненка, А.Г.Белых, Ю.В.Бічан, В.М.Бяспалаў, А.А.Вераб'ёў, В.З.Віткіна, Я.У.Гляцэвіч, З.В.Говарава, У.Ф.Даніленка, У.С.Дземідовіч, У.І.Драздоў, Л.Ф.Думаноўская, В.Р.Духаніна, С.С.Жураўлёў, А.М.Іванчанка, А.У.Ільіноў, С.А.Капроў, В.І.Капылоў, Л.А.Карманава, А.С.Кісель, В.П.Крапіўны, Л.А.Краснабай, Л.А.Кустова, Ю.К.Кустоў, Л.П.Луцэвіч, Г.В.Лява, М.А.Маціяшук, А.П.Назараў, І.М.Панамароў, Ю.П.Пурэцкі, Г.М.Пяшкоў, Т.Ф.Розава, В.В.Рысакоў, В.Б.Садыкаў, Л.А.Склярэнка, М.С.Смірноў, У.І.Старчанка, Л.Г.Сядых, У.Дз.Таліцкі, А.В.Тылевіч, Ю.І.Філонаў, В.С.Хвяжэнка, В.І.Ціхава, Ю.У.Чантурыя, А.А.Шабалін, Б.Э.Школьнікаў, М.М.Шляймовіч, Н.А.Шыдлоўская, Я.А.Якаўлеў. **1977**. А.І.Агафонава, А.Р.Акенцьеў, А.А.Антонава, А.Я.Балыка, Н.К.Белавусава, У.Г.Браўн, Н.С.Будыка, А.М.Быкоўскі, Г.Р.Вінаградава, М.С.Волкаў, Т.Я.Галіёта, А.С.Гаўрыкаў, Л.М.Гітлін, А.М.Горб, Р.В.Грынкевіч, Ю.М.Дабравольскі, І.Я.Дзятлаў, В.М.Дутлава, А.М.Іванін, Ю.С.Іўжанка, В.Г.Калінічэнка, А.П.Каралькоў, І.Е.Карасцялёў, В.К.Карунас, В.М.Кільчыцкі, У.Р.Крышчановіч, І.А.Леснякова, С.Г.Мацяўшук, А.В.Мысаў, Я.У.Мядзько, Д.С.Паташнікаў, І.С.Пілатовіч, А.У.Пятрэнка, І.П.Раўцкая, А.М.Радзівоненка, В.Р.Рондаль, С.Ф.Самбук, Л.М.Смірнова, А.Г.Суслаў, М.В.Сяўбітаў, В.Я.Токарава, А.З.Цэйтлін, У.І.Чарняўскі, К.Л.Шулаева, Л.К.Шулаеў, Ю.А.Якімовіч. **1978**. І.А.Абухаў, У.В.Аўсянка, Л.П.Баліцкая, Я.А.Вільчко, І.С.Гадэ, М.І.Жучко, І.Л.Каробкін, А.П.Козыраў, А.І.Корбут, А.В.Кузняцоў, В.К.Латышаў, У.А.Лытаў, А.А.Мазоль, А.І.Малашка, У.Дз.Маркаў, В.А.Мацура, Л.М.Нерадзюк, В.М.Папоў, С.Г.Пінчук, У.Б.Праабражэнскі, У.М.Сідзюк, С.А.Смірнова, Г.Г.Тарасава, У.К.Філатаў, З.Р.Цвірко, В.С.Цырш, Н.С.Чуйко, Г.І.Чырван. **1979**. Т.Р.Авечка, А.М.Арцюхін, А.В.Асяненка, У.І.Бакаеў, Э.К.Басава, В.М.Батузава, У.В.Бачкоў, А.І.Белавусаў, У.П.Данец, В.М.Данілаў, Я.У.Дворак, Л.Г.Зайцава, А.У.Івашкоў, Ю.І.Івашчанка, У.В.Карповіч, В.У.Кісель, Б.С.Косціч, А.М.Кулагін, І.А.Куніцкі, Т.А.Купрэева, Б.М.Малчанаў, А.С.Мальцаў, Ю.Я.Мамлін, В.А.Марухін, Т.В.Мікаэлян, В.П.Мусіенка, І.В.Навіцкі, В.Дз.Нікіцін, У.М.Перасадзька, Т.М.Пракаповіч, Т.М.Пукач, Ю.І.Раманаў, Н.С.Саладкова, С.П.Сахарава, В.Р.Слюнчанка, А.А.Суворай, А.В.Федарэнкаў, А.М.Філіповіч, У.М.Целяпнёў, І.С.Чаравікаў, Г.М.Шарый, М.А.Шумячар, І.У.Шчакоцін, Р.П.Яўменаў. **1980**. А.М.Аліфіранка, В.П.Андаралаў, В.У.Балоцін, Л.П.Баннава, Р.І.Белагорцаў, І.Л.Бікешчанка, Л.К.Быстрова, М.М.Гайдуковіч, У.Э.Гальдштэйн, М.Р.Гарон, Н.Я.Гоціна, М.М.Гроднікаў, Г.У.Гур'янаў, Л.Г.Дзям'янава, У.Г.Еўтух, Б.І.Кавалькоў, І.А.Каменскіх, Г.К.Кескевіч, В.В.Кірылаў, М.П.Кошалеў, І.М.Кравец, А.А.Крутава, А.В.Кухарэнка, В.А.Ліхапол, С.В.Манкевіч, А.І.Машуцін, В.М.Неўдах, Ф.Ф.Пархімовіч, Л.У.Паўлава, Л.М.Пілатовіч, Дз.М.Пуцявец, Г.М.Саглаева, В.У.Сакалова, В.П.Свічэнскі, Н.А.Сіроціна, А.Б.Смольскі, Т.П.Станішэўская, У.А.Тычына, Ю.Г.Цяпкін, А.Ф.Чэркас, В.М.Шалкоўскі, Н.М.Шарая, А.С.Шафрановіч, В.Я.Яўсееў. **1981**. В.І.Айсіна, І.І.Аляксеенка, У.А.Арлоўскі, С.Г.Багласаў, Л.С.Баскакава, В.Н.Беглякоў, Г.В.Бокун, Я.Ю.Болатаў, А.У.Брыгадны, В.А.Буры, Т.У.Бутрымовіч, Дз.І.Бялецкі, А.М.Вержук, І.К.Вінаградаў, А.Г.Воўк, Ю.П.Вялічка, У.К.Гагунскі, А.К.Галутвін, М.Л.Гаўхфельд, Г.Б.Гераўкер, В.А.Грэцкі, А.М.Гурбо, Г.У.Гур'янаў, Г.Б.Дыдыкіна, Г.П.Жаровіна, А.М.Калантай, В.В.Калнін, А.Ц.Караткоў, В.І.Каўрыговіч, А.К.Крывашэева, У.М.Крывуля, Н.Г.Курыліна, У.С.Ларын, І.А.Лаўрэнава, Г.П.Лядзяева, У.Г.Малахаў, І.А.Маніс, І.М.Марчанка, У.С.Маскалёў, У.К.Машукоў, М.В.Міхайлаў, С.П.Мульчэўская, В.Б.Навасёлак, В.М.Новікаў, М.І.Новікаў, Ю.І.Панчук, У.У.Пахолкін, С.А.Петракоў, У.В.Петухоў, А.Р.Прохараў, І.Л.Ром, Я.С.Ром, У.Дз.Севярынаў, М.А.Спясіўцава, Ю.М.Спясіўцаў, Г.Л.Танявіцкі, Л.А.Тарышыс, М.М.Турлюк, Л.І.Фамін, В.М.Хромаў, У.В.Чаленка, А.В.Чысты, Л.М.Шарамецьева, В.А.Шарамецьеў, В.П.Якавенка. **1982**. А.А.Бабуноў, С.І.Барысовіч, В.А.Бобрык, В.В.Васільеў, У.П.Галушчанка, І.В.Грышчынскі, В.Л.Драздоўскі, А.С.Дрэйцар, Дз.В.Дуднічэнка, В.С.Забродзец, С.С.Іваноў, А.Р.Канаваленка, І.І.Карват, А.А.Каўрэй, К.І.Кожыч, Я.П.Крапіўной, У.М.Кузняцоў, Ю.М.Кузьмін, Л.М.Куртанідзе, М.Ц.Лапато, І.В.Марозаў, Ю.А.Міхайлаў, В.А.Новікаў, А.М.Пятроў, А.І.Старасценка, У.М.Счыслёнак, У.Э.Сяргееў, У.С.Шаліма, А.І.Шарапава. **1983**. Н.А.Абухава, С.Б.Аляксандраў, М.Т.Багацеля, Э.І.Важнік, Л.С.Валахановіч, В.В.Васілюк, Л.Д.Вахоніна (Новікава), В.В.Вірасава, А.М.Галерка, В.У.Гаруновіч, В.М.Герус, Г.Г.Голубеў, М.М.Грэнь, Н.А.Гур'янава, Л.Б.Далгоўскі, У.А.Далецкі, Г.В.Дзмітронак, І.М.Дорахава, А.С.Дубініна, Г.А.Дулевіч, М.В.Емяльянаў, А.Г.Заборскі, Л.І.Каракоўцава, І.В.Карпаў, В.Г.Кескевіч, В.Ц.Клюковіч, Р.Б.Клябанава, Т.Я.Кузьміна, В.Б.Куняўскі, Н.М.Лісоўская, А.А.Мазалёў, Л.В.Макарэвіч, С.М.Мальшаў, А.Л.Мароз, Л.А.Мініна, Т.Г.Мураева, Б.Ц.Ніжагародаў, Я.А.Палітыка, М.П.Праваліпскі, М.Я.Прасолаў, А.Х.Прасяная, М.А.Пушкоў, А.М.Пятроў, Б.М.Розін, М.У.Рыбнікаў, У.Т.Рылькоў, В.М.Саломенік, Г.С.Саўчанка, У.В.Свідуновіч, Ж.Л.Сініцына, Ю.М.Скарэнка, В.А.Сокал, М.І.Сугака, А.Г.Сысоеў, У.В.Тамашэвіч, Г.І.Фрэнкель, Т.В.Халадзінская, Я.М.Ханіна, А.М.Цэван, У.М.Чайкоўскі, У.Л.Шахлевіч, А.В.Шорап, А.М.Юркавец, Э.А.Юшка, І.У.Яркова. **1984**. С.В.Анікін, Л.М.Белавусава, П.П.Бялюк, С.С.Вечар, В.М.Гапіенка, А.Я.Гарцуева, І.Я.Герасіменка, В.І.Гутман, А.А.Дарэнскі, А.І.Дыдышка, В.Г.Жаўняк, І.Я.Заслаўская-Алерс, С.Б.Ібраў, С.У.Іода, Т.П.Калеснік, А.Я.Кандратаў, Л.П.Качаноўская, У.Л.Куртанідзе, В.Б.Куцко, Л.П.Ларына, Г.А.Ліпуноў, І.В.Лукомская, В.В.Лукомскі, Т.І.Ляўданская, М.У.Мароз, А.І.Мартынаў, У.В.Мацельскі, У.К.Мацяш, А.І.Мінакоў, І.І.Навацкая, А.М.Перэльман, У.І.Плоткін, М.І.Рудэнка, А.А.Сазонаў, М.А.Сакалоў, В.В.Саурава, Б.Дз.Сідарэнка, Г.Дз.Фёдараў, А.А.Фралова, Т.У.Шаўлюкевіч, У.І.Шкарупін, Р.А.Шылай. **1985**. Ю.С.Ананіч, І.Б.Анікіна, М.А.Бабіч, Т.В.Багданава, В.В.Барташэвіч, А.А.Валовіч, Н.І.Вапнярская, А.А.Васкалей, А.І.Грэчын, В.К.Зайцаў, Л.А.Касцюк, С.К.Качаеў, К.К.Керуніс, Н.Б.Кузняцова, А.В.Ліхачоў, А.Ю.Лобушкін, М.К.Майструк, Н.П.Мартынава, А.І.Нічкасаў, Т.С.Осіпава, А.Л.Папін, Г.Я.Паркава, М.Л.Патэнт, Н.Ц.Прыбыль, А.А.Пятроў, А.А.Райскі, У.У.Сарока, У.І.Свінарэнка, Э.В.Святлова, І.В.Сініцкі, М.М.Суцягін, В.У.Тарасаў, Б.І.Тумашчык, І.П.Федарынчык, А.У.Хартанovіч, С.Я.Худайдатава, Т.В.Царова, А.І.Чадовіч, М.П.Чарненка, Л.Л.Чыгаева, Я.Я.Шапавалаў, А.Г.Шпанікаў, Л.М.Шулінская, Ю.Ю.Шчарбакоў, В.І.Шчэрбіч. **1986**. А.В.Афанасенка, А.В.Бандарэнка, Г.П.Баярына, У.А.Бірала, У.А.Будаеў, М.С.Вайтовіч, А.С.Вітко, Л.С.Галубкова, С.В.Данілаў, У.І.Дзмітрычэнка, П.А.Жараў, І.А.Захарава, Л.У.Зданевіч, П.А.Знак, Ю.А.Камісараў, С.Ф.Карповіч, С.А.Карчэўскі, У.М.Корань, А.З.Кратовіч, Л.Б.Крываносаў, Я.С.Кузняцоў, Л.П.Курзянкова, В.М.Ладзіс, А.Л.Лобаў, А.А.Лойка, Ю.Г.Магілёўкін, М.У.Маразюк, Ю.В.Нікалаеў, І.Ю.Патапаў, В.В.Путнік, І.Г.Ратнікаў, Л.Я.Селівончык, А.Ф.Сідзюк, Ю.І.Сонец, В.С.Судзілоўскі, І.І.Танаеўская, А.П.Таф, С.П.Трафімец, А.М.Філімонаў, І.В.Харэўскі, С.А.Хоміч, В.А.Цецераўкова, П.У.Цямноў, С.В.Чарніцкі, В.С.Чумак, У.С.Шаўчэнка, А.А.Штэн, С.Я.Шыманскі, В.І.Юхнеўская, В.А.Ясімчык. **1987**. Т.С.Бакун, В.К.Быкоўская, Н.А.Воінава, С.Б.Галалоб, М.М.Горбава, Н.І.Грахоўская, І.У.Дацюк, Л.А.Жлоба, Н.Г.Жуклевіч, С.Р.Казлоў, Т.В.Каленік, А.Р.Карчэўскі, Л.В.Кафанава, Н.Б.Кляўко, У.А.Корнеў, Л.М.Краснова, Б.С.Кудрават ых, Т.Ц.Кузняцова, І.А.Лабанава, У.М.Лагун, А.А.Літвінава, Т.М.Мацура, Л.П.Мацыпура, Э.В.Новікава, Л.Р.Орсіч, Л.І.Патапейка, В.І.Рылько, А.Я.Садчыкава, В.У.Сакалова, Л.Я.Сакевіч, Ю.А.Самойлік, М.Ю.Сапуноў, С.А.Сергачоў, М.А.Смарчок, А.В.Сцяпанаў, А.В.Трухін, В.М.Хаванскі, С.І.Цырш, А.П.Цяльцоў, М.І.Шавяльзон, А.Ф.Шаўчук, Г.Р.Штэйнман, М.В.Ярмольчык, І.В.Яршоў. **1988**. Г.Г.Баранец, Н.С.Белагорцава, К.В.Вазміцель, У.М.Галкоўскі, А.А.Галякоў, Л.Ф.Іванчанка, М.М.Іоська,

М.Я.Калечыц, А.І.Капцюг, Т.Р.Карпенка, Н.У.Кожар, Р.В.Літвак, С.У.Лявонаў, С.А.Малюк, А.Б.Марозава, А.У.Мяжэвіч, А.К.Падоксік, Т.А.Палаўнёва, Н.Я.Спяранская, А.І.Супрон, А.Б.Тараненка, В.В.Усімаў, А.А.Утулкін, В.А.Фралоў, М.А.Ягорава, А.А.Якімчук, К.К.Янчук. **1989**. М.Р.Алексяюк, У.Ю.Анісімаў, В.А.Брылёў, Э.Я.Валовіч, У.В.Гнаявой, В.В.Жарліцын, П.І.Жураў, М.М.Кітаеў, В.Л.Кобызеў, У.А.Кузьмін, Л.І.Ладзіс, С.В.Ларын, А.А.Літаш, Б.У.Лядзенка, У.І.Мелех, Г.А.Міцкевіч, А.А.Новікаў, І.Б.Нячай, Т.З.Паўлоўская, С.Ф.Платко, Ю.У.Рудых, В.У.Свінарэнка, У.Л.Стрыхар, В.А.Талкачоў, В.С.Турлюк, В.К.Ураваў, Л.М.Шакінка, В.М.Шыкавец. **1990**. А.А.Андраюк, У.В.Барэхаў, А.І.Быстроў, М.А.Гаеўская, Н.Р.Галякова, Л.П.Гарбачова, І.В.Дзямура, М.М.Дзятко, Н.С.Емяльянава, А.І.Жабрун, Р.Р.Зубарава, П.П.Зяленскі, Я.К.Калбовіч, Т.Ф.Косціч, Ф.Н.Муладжанаў, Н.А.Самусенка, А.Дз.Севярын, Г.А.Смактуновіч, Я.С.Урбан, З.З.Хайкіна, М.М.Царык, А.М.Цецярук, Б.Р.Цыёнскі, У.М.Шапавалаў, А.А.Шчапіла. **1991**. С.В.Асташонак, А.У.Бандарчык, Л.У.Бандарчык, Л.У.Белякова, І.А.Вайцяховіч, Дз.В.Герашчанка, В.А.Дзенісенка, М.Б.Ісламаў, Я.М.Іўліеў, В.І.Калечыц, Г.К.Касцюкевіч, А.Я.Катовіч, У.У.Кулевіч, І.М.Рацько, Ю.Г.Сакалоўскі, А.В.Свішчоў, Ю.А.Смольскі, А.М.Сямашка, А.Г.Трусаў, В.В.Турко, С.В.Чыгір, С.Л.Шайко. **1992**. В.К.Бялькевіч, Я.К.Верычай, В.В.Віслаўскі, А.Ю.Грыбаедава, К.Г.Джапарыдзе, А.А.Зафатаеў, У.Б.Зелянкевіч, А.П.Зіноўева, М.П.Зуеў, М.Г.Казак, А.І.Касабука, С.І.Куніцкі, В.М.Майсяюк, Н.А.Манаенкава, Ю.І.Нічкасаў, М.В.Пімашкоў, І.А.Савіцкі, Т.А.Свірская, В.І.Сысоева, Г.І.Чапурын. **1993**. Дз.С.Бубноўскі, Л.Л.Жук, І.І.Кананоўіч, Т.П.Лабінская, Т.М.Паткова, А.М.Раінчык, Дз.У.Сідзельнікаў, Я.В.Чараповіч. **1994**. М.А.Палякова, Т.І.Пешкава, Ю.У.Прудзялюк, М.Б.Самасюк, С.Л.Стоцкі. **1995**. А.І.Андрончык, А.Ф.Базевіч, В.У.Буры, В.Б.Васіленка, А.М.Волах, С.А.Галашоў, М.М.Жулёва, І.М.Казлоўскі, Л.А.Кішчук, І.Я.Кратовіч, Д.А.Крывашэй, Т.А.Лабанава, Э.А.Марцінчык, М.І.Міклашэвіч, В.Ф.Саннікава, Т.А.Шчаброва. **1996**. А.В.Ангелава, А.І.Грышан, В.С.Карпенка, В.В.Руцкі, А.А.Сярэдзіч. **1997**. У.І.Архангельскі, А.Ф.Канцэраў, Дз.А.Касьяненка, А.С.Пархута, В.І.Патапаў, С.Ф.Ткачэнка, П.І.Чуеў. **1999**. А.А.Барысенка, К.Б.Бражнік, А.С.Вашкевіч, Н.В.Дарашкевіч, Р.Ш.Даўлетшын, М.М.Кандалін, В.І.Карасёў, А.У.Касаткін, А.А.Лапко, І.У.Лапуноў, П.А.Ляшковіч, А.Дз.Міхайлюкоў, Г.У.Палянская, В.У.Стоцкая, Б.А.Хасан, В.А.Цыёнская, М.М.Чураба. **2000**. Н.М.Барабанава, І.І.Бельцюкова, В.У.Бельцюкоў, Л.А.Верхалап, Я.К.Гешчанок, І.В.Гудзік, Т.У.Зубела, С.І.Кавыроў, С.А.Кізілава, С.Р.Майсеенка, І.Г.Малкоў, А.В.Радзюк, Т.П.Разанава, Т.У.Сівая, А.А.Стаянава, В.І.Сцепанковіч, У.П.Талочка, А.І.Усольцаў, А.І.Цішкевіч. **2001**. А.І.Дубаневіч, Р.А.Зялінскі.

Т.Р.Мартыненка.

САЮ́З АРХІТЭ́КТАРАЎ МІЖНАРО́ДНЫ, Міжнародны саюз архітэктараў (МСА), міжнародная няўрадавая арганізацыя. Створаны ў 1948 у г. Лазана (Швейцарыя), сталае месцазнаходжанне штаб-кватэры — Парыж. Асн. задачы саюза: аб'яднанне на дэмакр. аснове архітэктараў усяго свету, абмен вопытам, павышэнне кваліфікацыі, умацаванне маст., навук. і прафес. сувязей паміж імі. Вышэйшы орган МСА — Асамблея (склікаецца раз у 3 гады), у час якой выбіраюцца Бюро і Савет. Быць членам саюза і прадстаўляць краіну можа толькі адна карпарацыйная арг-цыя (творчы саюз, асацыяцыя, ін-т і інш. арг-цыі архітэктараў). МСА аб'ядноўвае больш за 100 нац. секцый і рэгіянальных груп (Скандынаўскія краіны, краіны Балтыі і інш.). Нац. секцыі ўваходзяць паводле тэрытарыяльнай прыкметы ў адпаведныя рэгіёны, кожны з якіх узначальвае віцэ-прэзідэнт (Зах. Еўропа, Усх. Еўропа і Сярэдні Усход, краіны Амерыкі, Азія і Аўстралія, Афрыка). У рамках дзейнасці МСА функцыянуюць больш за 10 рабочых груп і праграм, працуюць камісія па міжнар. конкурсах (засн. Залаты медаль за выдатныя творчыя дасягненні, прызы за лепшы праект), праграма па прафес. практыцы і інш. Саюз мае кансультатыўны статус пры ЮНЕСКА, Эканам. і сац. савеце ААН. Выдаецца Бюлетэнь МСА (выходзіць раз у 2 месяцы). У 1990-я г. ў МСА уваходзіў *Саюз архітэктараў Беларусі.*

САЮ́З БАРАЦЬБЫ́ ЗА ВЫЗВАЛЕ́ННЕ РАБО́ЧАГА КЛА́СА, гл. *Пецярбургскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа».*

САЮ́З БЕЛАРУ́СКАГА ПРАВАСЛА́ЎНАГА ДУХАВЕ́НСТВА (СБПД), арганізацыя нацыянальна арыентаванай часткі бел. правасл. святароў Віленскай і Гродзенскай губ., якія знаходзіліся ў эвакуацыі. Створаны напярэдадні Лют. рэвалюцыі 1917 у Маскве. У СБПД уваходзілі протаіерэі І.У.Карчынскі, С.І.Кульчыцкі, святары Л.С.Паеўскі, Рапнін, Усякоўскі і інш. Саюз далучыўся да бел. нац. руху з цэнтрам у Маскве. Летам 1917 правёў з'езд правасл. святароў-беларусаў, на якім прынята рэзалюцыя ў нац. духу. Члены саюза супрацоўнічалі з арг-цыяй бел. каталіцкага духавенства «Хрысціянская дэмакратычная злучнасць» (пазней — *Беларуская хрысціянская дэмакратыя*), імкнуліся да беларусізацыі царк. жыцця, праводзілі пропаведзі на бел. мове. Спыніў дзейнасць у пач. 1918. Актыўныя члены СБПД былі арыштаваны.

А.І.Валаховіч.

САЮ́З БЕЛАРУ́СКАЙ ДЭМАКРА́ТЫІ, грамадска-палітычная арг-цыя заходнерусісцкага кірунку, якая дзейнічала ў Гомелі ў крас.—ліст. 1917. Ініцыятарам стварэння саюза выступіла група работнікаў асветы і дзярж. служачых, эвакуіраваных з Вільні. На сходзе «беларусаўдэмакратаў» 23 крас. выказана думка пра стварэнне С.б.д. з-за нязгоды з пастановамі з'езда Бел. нац. арг-цый (25—27 сак.) і непрызнаннем *Беларускага нацыянальнага камітэта* ў Мінску ў якасці кіруючага цэнтра нац. руху. Сход пастанавіў стварыць «Часовы беларускі дэмакратычны камітэт» з 10 чал., старшынёй к-та выбраны П.В.Каранкевіч, яго намеснікамі — Д.Г.Гулевіч, і Ф.В.Шышко. Дзейнасць саюза выявілася ў выступленнях супраць заклікаў набыцця нац. аўтаноміі, нацыяналізацыі школы і інш. На выбарах ва Устаноўчы сход С.б.д. аб'яднаўся з *Беларускай народнай грамадой, Беларускім нацыянальным камітэтам у Магілёве* і Аршанскім бел. к-там. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 саюз спыніў сваю дзейнасць.

Літ.: Сяменчык М.Я. Беларускія палітычныя арганізацыі краю і іх дзейнасць у сакавіку—чэрвені 1917 г. // Культурна-нацыянальныя працэсы на Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX стст.: Зб. навук. прац. Мн., 1998.

М.Я.Сяменчык.

САЮ́З БЕЛАРУ́СКАЙ МО́ЛАДЗІ (СБМ), маладзёжная арг-цыя на акупіраванай ням.-фаш. захопнікамі тэр. Беларусі і ў Германіі ў Вял. Айч. вайну. Створаны 22.6.1943 па ініцыятыве герм. улад на ўзор саюза гітлераўскай моладзі (Гітлер-югенд) паводле загаду ген. камісара Беларусі В.Кубэ. Дзейнічаў пад кантролем аддзела моладзі Ген. камісарыята Беларусь і спецслужбаў. Вышэйшы орган СБМ — Кіруючы штаб на чале з М.Ганько (мужчыны) і Н.Абрамавай (жанчыны). Штаб знаходзіўся ў Мінску, з ліп. 1944 — у Берліне; падпарадкоўваўся Бел. цэнтр. радзе. Друкаваныя органы: час. «*Жыве Беларусь!*», газ. «Юнацкі покліч». Гал. мэтай саюза была падрыхтоўка новай генерацыі беларусаў у духу герм. нацыянал-сацыялізму. СБМ павінен быў аб'ядноўваць бел. моладзь ва ўзросце 10—20 гадоў, яго дзейнасць будавалася на жорсткім прынцыпе фюрэрства. За чэрв. 1943 — ліп. 1944 на акупіраванай тэр. Беларусі падрыхтавана каля 1500 функцыянераў малодшага, сярэдняга і вышэйшага звяна СБМ. На 1.7.1944 адзінкі СБМ былі створаны ў 16 акругах і больш як 60 паветах, у іх налічвалася больш за 12,6 тыс. чал., з якіх 3,5 тыс. былі аб'яднаны ў рабочую групу СБМ «Германія» і працавалі на ваен. прадпрыемствах Трэцяга рэйха. Члены саюза прыцягваліся да ваен.-буд. і гасп. работ на акупіраванай тэр. Беларусі. Пад уплывам перамог Чырв. Арміі, прапагандысцкай і арганізац. дзейнасці сав. падполля многія радавыя члены і некат. кіраўнікі СБМ пераходзілі на бок партызан. Частка актыўных членаў (каля 3 тыс. чал.) пакінула Беларусь разам з адступаючай герм. арміяй. Дзейнасць СБМ працягвалася да вясны 1945 на тэр. Германіі. За ўдзел у СБМ пасля вайны судзілі як за здраду Радзіме, садзейнічанне акупантам і інш.

Літ.: Кавaленя А.А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі, 1941—1944: Вытокі. Структура. Дзейнасць. Мн., 1999.

А.А.Кавaленя.

САЮ́З БЕЛАРУ́СКІХ ПІСЬМЕ́ННІКАЎ (СБП), добраахвотная грамадская творчая арг-цыя прафес. літаратараў Беларусі. Закліканы садзейнічаць напісанню твораў высокага маст. ўзроўню, спрыяць развіццю форм, стыляў і жанраў л-ры, памагаць творчаму росту маладых пісьменнікаў, развіваць і мацаваць сувязі л-р блізкага і далёкага замежжа. Створаны паводле пастановы ЦК КП(б)Б ад 27.5.1932 «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый БССР». Арганізацыйна аформлена 1-м Усебеларускім з'ездам пісьменнікаў (Мінск, 8—14.6.1934) як Саюз пісьменнікаў Беларусі. З 1994 сучасная назва. Кіруючы

орган — з'езд пісьменнікаў, паміж з'ездамі — рада. Старшыні СБП: М.М.Клімковіч (1934—38), М.Ц.Лынькоў (1938—48), П.У.Броўка (1948—66), М.Танк (1966—80), Н.С.Гілевіч (1980—89), В.В.Зуёнак (1989—98), У.П.Някляеў (1998—99), В.М.Іпатава (в.а. 1999, з 2001).

Творчая работа вядзецца праз секцыі паэзіі, прозы, крытыкі і літаратуразнаўства, дзіцячай і юнацкай л-ры, маст. перакладу, літаратурных узаемасувязей, нарыса і публіцыстыкі, камісіі: прыёмную, ваенна-шэфскую, педагагічную, па рабоце з маладымі. Мае аддзяленні ў Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях. У 1945 у СБП было 47 членаў, да 13-га з'езда пісьменнікаў (май 2001) — 505 членаў..

Члены Саюза беларускіх пісьменнікаў

(з-за адсутнасці дакументаў спісы 1934—43 няпоўныя)

1934. З.М.Аксельрод, А.І.Александровіч, Баранавых Сымон (С.Я.Баранаў), І.М.Барашка, Я.А.Бранштэйн, П.У.Броўка, Л.А.Бэндэ, Бядуля Змітрок (С.Я.Плаўнік), Ф.В.Вайшнорас, Вольны Анатоль (А.І.Ажгірэй), Вольскі Віталь (В.Ф.Зэйдэль), П.Р.Галавач, Галубок Уладзіслаў (У.І.Голуб), Гартны Цішка (З.Х.Жылуновіч), Ю.П.Гаўрук, У.М.Глазырын, П.Ф.Глебка, А.К.Гурло, І.Д.Гурскі, Дарожны Сяргей (С.М.Серада), Ц.Л.Даўгапольскі, Дудар Алесь (А.А.Дайлідовіч), Х.М.Дунец, Г.К.Жарскі, Зарэцкі Міхась (М.Я.Касянкоў), Каваль Васіль (В.П.Кавалёў), У.А.Кавальскі, Г.М.Камянецкі, Л.А.Кацовіч, М.М.Клімковіч, Колас Якуб (К.М.Міцкевіч), А.М.Крапачоў, Крапіва Кандрат (К.К.Атраховіч), М.С.Кульбак, А.А.Куляшоў, Купала Янка (І.Д.Луцэвіч), Дз.І.Курдзін, Кучар Алесь (А.Е.Кучар), М.Ц.Лынькоў, В.Дз.Маракоў, Маўр Янка (І.М.Фёдараў), Б.М.Мікуліч, Міровіч Еўсцігней (Е.А.Дунаеў), М.М.Модэль, Р.Д.Мурашка, М.Т.Паслядовіч, Б.К.Паўлюкявічус, А.Х.Платнер, Я.С.Рамановіч, Г.Л.Раманоўская, Э.Л.Самуйлёнак, Скрыган Ян (І.А.Скрыган), В.П.Сташэўскі, У.М.Хадыка, І.Д.Харык, Хведаровіч Мікола (М.Ф.Чарнушэвіч), Чарот Міхась (М.С.Кудзелька), Чорны Кузьма (М.К.Раманоўскі), І.Е.Шапавалаў, С.П.Шушкевіч, Х.С.Шынклер, А.І.Якімовіч. **1935**. А.А.Зарыцкі, Звонак Алесь (П.Б.Звонак), Р.Я.Кобец. **1936**. Р.Л.Рэлес, У.Г.Фінкель. **1937**. Агняцвет Эдзі (Э.С.Каган), В.В.Барысенка. **1938**. П.Е.Панчанка. **1939**. Астрэйка Анатоль (А.П.Астрэйка), М.М.Блісцінаў, Р.С.Бярозкін, Журба Янка (І.Я.Івашын), М.Р.Ларчанка, А.Я.Міронаў, П.С.Пестрак, А.Г.Русак, Р.К.Сабаленка, Я.І.Садоўскі, К.М.Цітоў. **1940**. С.Н.Гусеў, Іверс Анатоль (І.Д.Міско), М.І.Калачынскі, У.І.Краўчанка, М.А.Машара, Танк Максім (Я.І.Скурко), Н.М.Тарас, Шарахоўскі Янка (І.З.Шарахоўскі). **1941**. В.П.Таўлай. **1942**. Л.Л.Шапіра. **1943**. А.П.Бялевіч, Вітка Васіль (Ц.В.Крысько), К.Ц.Кірэенка, Лужанін Максім (А.А.Каратай). **1944**. Буйло Канстанцыя (К.А.Калечыц), М.Р.Лупсякоў. **1945**. Брыль Янка (І.А.Брыль), М.А.Засім, П.Н.Кавалёў, І.П.Мележ. **1946**. У.І.Агіевіч, А.М.Бачыла, Васілёк Міхась (М.В.Касцевіч), А.С.Вялюгін, М.І.Гамолка, І.І.Грамовіч, І.В.Гутараў, У.Б.Карпаў, В.С.Лютава, У.І.Няфёд, Р.В.Нях хай. **1947**. М.І.Аляксееў, А.К.Астапенка, М.Я.Аўрамчык, А.С.Васілевіч, М.А.Гарулёў, К.Л.Губарэвіч, А.А.Есакоў, Дз.М.Кавалёў (з 1959 у Маскоўскай пісьменніцкай арг-цыі), А.М.Кулакоўскі, С.К.Майхровіч, Маўзон Аркадзь (А.І.Маўшэнзон), П.К.Прануза, П.Ф.Прыходзька, Русецкі Аляксей (А.С.Бурдзялёў), М.Ф.Садковіч, Т.К.Хадкевіч, І.П.Шамякін, У.М.Шахавец. **1948**. Я.Б.Герцовіч, У.І.Корбан, В.І.Матэвушаў, М.Г.Ткачоў, Р.В.Шкраба. **1949**. П.І.Валкадаеў, А.Я.Макаёнак, Палескі Вячаслаў (В.П.Станкевіч), І.К.Сіўцоў, В.С.Сурская. **1950**. Б.І.Бур'ян, Э.С.Валасевіч, М.П.Данілёнка, С.С.Дзяргай, І.Ф.Кудраўцаў, М.П.Лобан, Ю.С.Пшыркоў, А.В.Пысін. **1951**. А.А.Алешка, М.М.Барсток, В.Е.Бурносаў, Дуброўскі Ігнат (І.Ц.Чарняўскі), М.М.Пянкрат, Ракітны Мікола (М.І.Новікаў), Я.К.Усікаў. **1952**. М.А.Вішнеўскі, В.А.Зуб, А.П.Кузьмічоў (у 1952—67 у пісьменніцкай арг-цыі г. Тбілісі), А.І.Рылько, В.Дз.Сакалоў, П.П.Шасцерыкоў, А.А.Шашкоў. **1953**. Я.П.Васілёнак, П.М.Макаль, І.А.Муравейка, У.М.Юрэвіч. **1954**. Багушэвіч Юрый (Г.К.Багушэвіч), М.М.Ваданосаў, П.С.Васілеўскі, Н.С.Гілевіч, А.В.Іваноў, В.У.Івашын, Казека Янка (І.Д.Казека), Н.З.Кіслік, Дз.А.Палітыка, Н.С.Перкін, Л.А.Салавей, Семяжон Язэп (І.І.Семяжонаў), А.А.Семяновіч, М.І.Татур, А.Дз.Чарнышэвіч, І.Ц.Шуцько. **1955**. С.Х.Александровіч, Вольскі Артур (А.В.Зэйдэль), С.З.Гаўрусёў, У.І.Дадзіёмаў, Ф.І.Куляшоў, А.М.Лазнявой (з 1971 у пісьменніцкай арг-цыі г. Чэлябінск), П.М.Рунец, М.С.Смагаровіч, Б.П.Спрынчан. **1956**. М.А.Герасімаў (у 1956—57 у пісьменніцкай арг-цыі г. Чкалаў), С.І.Грахоўскі, І.Л.Дорскі, А.Н.Карпюк, А.В.Пальчэўскі. **1957**. А.М.Адамовіч, А.Х.Асіпенка, А.Ц.Бажко, З.А.Бандарына, Я.І.Бяганская, І.І.Васілеўскі (у 1957—67 у Смаленскай пісьменніцкай арг-цыі), У.С.Караткевіч, І.С.Клаз, Е.Я.Лось, А.І.Махнач, І.Я.Навуменка, М.А.Сергіевіч, М.М.Чавускі, Н.Т.Чарнушэвіч. **1958**. А.А.Авечкін, Л.Л.Арабей, М.М.Арочка, Р.І.Барадулін, У.М.Дубоўка (з 1968 у Маскоўскай пісьменніцкай арг-цыі), Непачаловіч Янка (І.Д.Непачаловіч), У.І.Нядзведскі, Н.Е.Пашкевіч, Пушча Язэп (Я.П.Плашчынскі), М.А.Скрыпка, Г.Я.Шмань (з 1962 у пісьменніцкай арг-цыі г. Тула). **1959**. В.У.Быкаў, М.Г.Дуброўскі, А.Н.Марціновіч, Г.Л.Папоў, І.М.Пташнікаў, І.І.Сіняўскі. **1960**. В.У.Адамчык, Х.Дз.Жычка, У.А.Калеснік, А.К.Клышка, А.А.Лойка, А.А.Макарэвіч, Мехаў Уладзімір (У.Л.Няхамкін), Г.А.Новік, Б.І.Сачанка, Д.Р.Сіманоўіч, В.Ф.Хомчанка. **1961**. Дз.Я.Бугаёў, Г.М.Бураўкін, У.А.Варно (з 1975 у пісьменніцкай арг-цыі г. Петрапаўлаўск-Камчацкі), А.З.Гутковіч, А.А.Дракахруст (у 1961—64 у пісьменніцкай арг-цыі г. Хабараўск), Я.С.Ермаловіч, Ю.М.Канэ, І.В.Козел, І.Р.Новікаў, Л.Я.Прокша, А.А.Савіцкі, Ю.М.Свірка, Сіпакоў Янка (І.Д.Сіпакоў), В.Я.Тарас, П.А.Харкоў, К.А.Цвірка, К.М.Шней-Красікаў (з 1969 у пісьменніцкай арг-цыі г. Краснаярск), Г.У.Шыловіч, М.Н.Яромушкін. **1962**. У.М.Дамашэвіч, В.А.Каваленка, І.І.Калеснік, Я.І.Курто, У.І.Ляпёшкін, У.А.Паўлаў, А.С.Ставер, М.Л.Стральцоў, В.Ф.Трыхманенка, М.М.Фігуроўскі (з 1966 у Маскоўскай пісьменніцкай арг-цыі), У.М.Шыцік, Ф.А.Яфімаў. **1963**. Л.А.Вакулоўская (у 1963—66 у пісьменніцкай арг-цыі г. Калінінград), В.С.Гарбук. **1964**. Д.Я.Бічэль-Загнетава, І.Ц.Бурсаў, Г.Г.Васюкова, Вярба Вера (Г.П.Сакалова), А.І.Вярцінскі, Л.І.Гаўрылкін, М.Н.Герчык, М.П.Гроднеў, А.С.Дзеружынскі, Я.І.Каршукоў, Г.В.Кісялёў, І.У.Клімашэўская, Г.Я.Кляўко, Г.Д.Колас, М.П.Кругавых, Лакербай Юрый (Ю.А.Лакербая; з 1976 у Маскоўскай пісьменніцкай арг-цыі), А.П.Наўроцкі, С.М.Прошын (з 1967 у пісьменніцкай арг-цыі г. Воранеж), А.В.Сабалеўскі, Р.Я.Тармола, П.І.Ткачоў, Дз.І.Уксусаў, І.Г.Чыгрынаў, І.І.Шклярэўскі (з 1968 у Маскоўскай пісьменніцкай арг-цыі), В.М.Шымук, С.Г.Яўсеева. **1965**. І.А.Аношкін, М.А.Грамыка, А.С.Грачанікаў, А.А.Дзялендзік, А.Р.Кобец-Філімонава, В.Г.Панамароў, У.М.Стэльмах. **1966**. П.П.Ахрыменка, В.В.Зуёнак, Палтаран Вера (В.С.Лясеская), М.М.Рудкоўскі, Р.Р.Шырма, А.С.Яскевіч. **1967**. П.К.Дзюбайла, Зазека Язэп (І.В.Зазека), М.С.Кусянкоў, А.С.Ліс, У.А.Ляўданскі, А.В.Мальдзіс, В.Ц.Мыслівец, І.І.Мяла, С.С.Панізнік, А.С.Сербантовіч, Ю.С.Фатнеў (з 1974 у пісьменніцкай арг-цыі г. Бранск), Т.Р.Цулукідзе, Шумаў Міхаіл (М.І.Шульман). **1968**. А.П.Кудравец, П.А.Місько, Ф.М.Янкоўскі, М.Р.Ярош. **1969**. С.А.Гусак, В.Б.Дайліда, М.М.Дукса, В.Ф.Карамазаў, У.Г.Кудзінаў, С.П.Масіяш (у 1969—72 у пісьменніцкай арг-цыі г. Уральск), А.Ф.Пінчук (з 1975 у пісьменніцкай арг-цыі г. Львоў), В.П.Рагойша, Р.М.Семашкевіч, А.А.Слесарэнка, А.П.Чаркасаў. **1970**. Г.А.Васілеўская, М.А.Вышынскі, А.К.Гардзіцкі, Л.М.Дайнека, В.М.Іпатава, А.Л.Кандрусевіч, У.І.Карызна, М.А.Маляўка, У.Г.Машкоў, І.Дз.Ралько, Л.С.Рашкоўскі, У.М.Скарынкін, Э.М.Скобелеў, Д.Ф.Слаўковіч, І.К.Сяркоў, Х.М.Чэрня, Г.К.Шутэнка, Э.С.Ярашэвіч. **1971**. В.Л.Бечык, Ю.У.Голуб, М.М.Грынчык, К.В.Камейша, М.П.Луфераў, М.Я.Матукоўскі, Н.І.Мацяш, У.Н.Мяжэвіч, П.І.Пруднікаў, А.М.Пяткевіч, А.А.Шаўня, Я.І.Янішчыц. **1972**. С.А.Андраюк, У.В.Гніламёдаў, В.П.Жураўлёў, Н.К.Зверава (з 1975 у пісьменніцкай арг-цыі г. Калінінград), С.І.Кухараў, М.А.Лазарук, А.Г.Масарэнка, С.А.Міхальчук, В.В.Нікіфаровіч, А.С.Разанаў, В.С.Рудаў, У.І.Савіцкі, У.К.Федасеенка, М.М.Федзюковіч, М.М.Чарняўскі, Э.В.Ялугін. **1973**. А.А.Жук, В.А.Казько, М.І.Мушынскі, А.П.Рыбак, А.А.Савелічаў. **1974**. Дз.А.Бяспалы, Г.В.Далідовіч, А.П.Капусцін, У.І.Кузьмянкоў, М.П.Парахневіч, А.Л.Петрашкевіч. **1975**. Гіль Мікола (М.С.Гілевіч), Каліна Клаўдзія (К.К.Лукашэвіч), Каштанаў Арнольд (А.Л.Эпштэйн), Коўтун Валянціна (В.М.Новік), Крыга Алесь (А.А.Асіпенка), Левановіч Леанід (Л.К.Лявонаў), Я.Р.Радкевіч, Г.С.Шупенька, Г.Ф.Юрчанка. **1976**. У.М.Верамейчык, Г.А.Каржанеўская, В.С.Макарэвіч, П.А.Марціновіч, М.А.Тычына. **1977**. Р.А.Баравікова, В.С.Гігевіч, Э.С.Гурэвіч, В.А.Жуковіч, С.І.Законнікаў, У.М.Казбярук, Л.Т.Калодзежны, Я.Р.Лецка, Г.П.Пашкоў, А.У.Салтук, В.С.Сёмуха, Тулупава Нэлі (Н.І.Лісоўская), Я.П.Шабан, І.І.Шыламанаў, В.Ц.Якавенка. **1978**. Т.М.Бондар, А.С.Вечар, М.Г.Воранаў, В.А.Лукша, У.П.Някляеў, М.І.Чаргінец. **1979**. У.І.Анісковіч, І.С.Арабейка, Б.П.Беляжэнка (Беліжэнка), А.У.Варановіч, Н.Б.Ватацы, В.К.Гардзей, Т.І.Гарэлікава, Г.Р.Дзмітрыеў, А.М.Дзятлаў, А.А.Дударай, Г.І.Егаранкава (з 1981 у пісьменніцкай арг-цыі г. Ніжні Ноўгарад), У.С.Ліпскі, А.Г.Папова, В.А.Ракаў, М.С.Шаўчонак, К.Р.Шэрман, М.І.Янчанка. **1980**. З.Я.Бірала, Верабей Яўген (Я.В.Міклашэўскі), С.Л.Дорскі, Я.М.Крупенька, С.Л.Курылёва, І.К.Стадольнік, В.У.Ярац. **1981**. Блакіт Валянцін (В.У.Болтач), Г.Ф.Бубнаў, В.С.Гарбацэвіч, У.А.Жыжэнка, А.К.Кажадуб, А.М.Казловіч, І.І.Капыловіч, М.П.Кацюшэнка, М.П.Корзун, П.С.Лісіцын, А.П.Мельнікаў, М.М.Мятліцкі, А.П.Палітыка, І.Т.Панчанка, У.А.Папковіч, М.М.Пракаповіч, А.К.Сульянаў, Л.К.Тарасюк, Л.Ф.Яўменаў. **1982**. С.М.Басуматрава, Верас Зоська (Л.А.Войцік), В.І.Дашкевіч, А.М.Жыгуноў, Н.С.Загорская, Кейзараў Аляксей (А.С.Кейзераў), М.І.Клебановіч, У.М.Конан, С.С.Лаўшук, Я.С.Пархута, У.Я.Рубанаў, У.П.Саламаха, В.Б.Спрынчан, А.І.Сямёнава, Л.А.Філімонава, У.П.Чапега. **1983**. С.А.Алексіевіч, С.У.Букчын, Ждан Алег (А.А.Пушкін), П.А.Ламан, Х.А.Лялько, Н.В.Маеўская, Г.В.Марчук, В.І.Рабкевіч, К.І.Тарасаў, В.С.Трасцянскі, К.Р.Хромчанка, А.І.Цяжкі, В.А.Чамярыцкі, Т.І.Шамякіна, Р.М.Яўсееў. **1984**. Л.М.Галубовіч, Л.В.Дранько-Майсюк, М.Ф.Дубянецкі, А.І.Канапелька, А.К.Каско, У.М.Мазго, У.А.Марук, С.М.Новік-Пяюн, А.У.Пісьмянкоў, А.С.Сопат, П.П.Сушко, В.А.Шніп, У.Дз. Якутаў. **1985**. П.І.Бітэль, Н.В.Галіноўская, Л.С.Караічаў, С.М.Марчанка, С.Я.Паўлаў, А.В.Руцкая, І.Я.Скарынкін, А.А.Станюта, В.П.Супрунчук, В.К.Хаўратовіч, Л.Ф.Хейдарава, І.А.Чарота, У.І.Ягоўдзік. **1986**. В.В.Аколава, У.А.Арлоў, А.М.Асташонак, Я.Д.Будзінас, У.С.Глушакоў, У.І.Дзюба, З.І.Дудзюк, А.М.Емяльянаў, А.П.Жалязоўскі, Л.А.Казыра, Г.А.Каханоўскі, С.М.Клімковіч,

А.І.Кудраўцаў, З.К.Прыгодзіч, І.У.Скурко, Л.І.Шырын. **1987**. Г.А.Булыка, У.П.Бутрамееў, І.Ф.Жарнасек, Казанаў Барыс (Б.М.Рыўкін), А.А.Марціновіч, В.Ф.Праскураў, М.К.Філіповіч, А.К.Шлег. **1988**. М.З.Башлакоў, А.Л.Верабей, Глобус Адам (У.В.Адамчык), В.А.Дубінка, К.Я.Жук, А.А.Камароўскі, М.П.Кенька, І.П.Клімянкоў, У.І.Мархель, А.Г.Мінкін, Наварыч Алесь (А.І.Трушко), В.Я.Сахарчук, М.Л.Стрыгалёў, А.Ц.Сыс, Т.К.Чабан, Г.Б.Чарказян, І.П.Чыгрын, П.М.Шруб, М.М.Шэлехаў. **1989**. Ю.М.Багданаў, І.Э.Багдановіч, Л.П.Баршчэўскі, М.У.Барэйша, М.І.Буcько, М.І.Ермаловіч, А.П.Жамойцін, С.М.Зайцаў, М.М.Зарэмба, Зьніч (А.А.Бембель), С.В.Кавалёў, М.А.Круль, В.А.Куляшова, Л.І.Пранчак, Я.Э.Пфляўмбаўм, Саламевіч Янка (І.У.Саламевіч), В.Ю.Ткачоў, Я.І.Хвалей. **1990**. А.М.Бадак, А.М.Бароўскі, М.А.Вайцяшонак, Н.Я.Гальпяровіч, В.М.Грышановіч, Л.В.Забалоцкая, Т.В.Кабржыцкая, В.В.Карпечанка, І.Р.Катляроў, М.П.Лук'янаў, Мальчэўская Яўгенія (Я.Е.Крыжаноўская), У.А.Навумовіч, А.У.Рагуля, Рублеўская Людміла (Л.І.Шніп), У.М.Сіўчыкаў, Сокалаў-Воюш Сяржук (С.А.Сокалаў), П.Ф.Стэфановіч, А.П.Траяноўскі, Л.М.Турбіна, А.М.Федарэнка, С.М.Шах, В.А.Шырко, А.М.Якімовіч. **1991**. М.А.Арахоўскі, П.В.Вараб'ёў, Х.Х.Гурыновіч, І.В.Жук, К.М.Ільюшчыц, А.С.Казлоў, Г.І.Кірылаў, І.А.Кірэйчык, В.С.Кудлачоў, Куртаніч Вольга (В.І.Мешчаракова), Т.В.Мельчанка, Пісарык Алесь (А.У.Пісарчык), І.І.Рубін, Сцяпан Уладзімір (У.А.Сцепаненка), М.У.Скобла, Тумаш Генадзь (Я.Дз.Тумас), У.Т.Халіп. **1992**. Э.А.Акулін, І.М.Афанасьеў, Г.Б.Багданава, М.Я.Баравік, Баторын Фелікс (Ф.Б.Хаймовіч), Блажэнны Веніямін (В.М.Айзенштат), В.Ф.Грышкавец, Н.Я.Гублер, І.І.Кананоўіч, С.Т.Каробкіна, З.З.Марозаў, У.І.Мацвеенка, М.П.Пазнякоў, Ц.А.Панцюшэнка, Л.С.Савік, Г.В.Станкевіч. **1993**. Анашка Францішак (Ф.І.Сіўко), А.Ю.Аўруцін, М.П.Вяршынін, П.І.Гарэцкі, А.І.Дэбіш, В.І.Дэбіш, А.А.Жук, Р.К.Ігнаценка, Кавалюк Аўгіння (Я.Т.Кавалюк), М.А.Клімковіч, С.А.Крываль, М.Н.Мінчанка, Пятровіч Барыс (Б.П.Сачанка), У.Л.Сакалоўскі, М.М.Сердзюкоў, Случанін Лявон (Л.Р.Шпакоўскі), В.І.Стома, Г.К.Тычка, Шайбак Міраслаў (М.В.Адамчык), Ялоўчык Лідзія (Л.П.Ліcок), М.Б.Яфімава. **1994**. Аксак Валянціна (В.І.Арлова), Валошка Максім (А.І.Бутэвіч), П.В.Васючэнка, Віж Мар'ян (М.М.Зайцаў), В.Ц.Галавач, І.Я.Гурбан, С.Ф.Давідовіч, У.У.Дуктаў, І.В.Зуб, А.М.Зэкаў, М.С.Купрэеў, І.С.Курбека, Р.Я.Лапушын, В.В.Лапшк, Лаўроў Уладзімір (У.Б.Ідэальсон), В.І.Лужкоўскі, І.В.Малец, Дз.А.Падбярэзскі, І.М.Пракаповіч, Л.Ц.Пракопчык, У.У.Сауліч, М.М.Трафімчук, С.А.Трахімёнак, А.Я.Хатэнка, Н.Ф.Цыпіс, Чаромхін Васіль (В.І.Найдзін), А.Ф.Чобат. **1995**. Баравы Янка (І.І.Галубовіч), Барскі Алесь (А.А.Баршчэўскі), М.Р.Гайдук, В.П.Грыцкевіч, М.І.Дзелянкоўскі, М.А.Дубоўскі, В.А.Кастручын, А.М.Кірвель, У.А.Клімовіч, В.С.Маскаленка, М.І.Мішчанчук, В.К.Небышынец, А.А.Пашкевіч, П.П.Савоська, Р.В.Сакалоўскі, В.І.Сарока, В.Р.Супрун, І.Л.Сяргейчык, Я.Я.Янушкевіч. **1996**. Н.К.Аксёнчык, А.Б.Альфяровіч, М.Дз.Антаноўскі, С.М.Белы, І.А.Карэнда, Я.І.Клімуць, І.І.Лашутка, А.Ф.Майсееў, М.Б.Марцінкоўскі, У.Ф.Міхно, У.Г.Пешкевіч, У.Р.Правасуд, В.А.Праўдзін, В.І.Рагаўцоў, У.І.Содаль, С.В.Тарасаў, І.А.Шахрай, Явар Святлана (С.Б.Сачанка). **1997**. Артханаў Глеб (Ю.І.Аляксееў), А.В.Бяляцкі, Р.С.Бялячыц, Э.Л.Вайвадзіш, С.В.Валодзька, Г.А.Варатынская, В.Р.Гурскі, Ю.І.Залоска, Н.Дз.Кавалёва, М.Ф.Карпенка (у 1980—97 у пісьменніцкай арг-цыі г. Ашгабат), В.Р.Когут, А.М.Крэйдзіч, М.Д.Львовіч, М.Я.Лукша, Ляшонак Тамаш (Ф.В.Ляшонак), У.В.Мароз, Н.Дз.Марціновіч, В.У.Петручук, В.А.Санько, І.К.Цішчанка, К.П.Цыбульскі, М.М.Чарняўскі, В.К.Шабалтас, М.З.Шаховіч, А.І.Шушко. **1998**. Аржаны Аркадзь (В.І.Кунцэвіч), С.А.Астраўцоў, У.У.Барысенка, А.Я.Белы, Р.М.Бензярук, А.І.Бібішкі, Ветах Алесь (А.І.Бельскі), В.Р.Гарановіч, В.Ф.Гіруць-Русакевіч, А.Ф.Гуцаў, А.Н.Давыдаў, У.Ф.Ермалаеў, А.М.Канапелька, А.М.Карлюкевіч, Я.Ф.Коней, Я.І.Крамко, М.А.Курыла, В.І.Локун, А.К.Лягчылаў, М.А.Манохін, Наталіч Марына (Н.А.Давыдзенка), А.І.Нафрановіч, Л.П.Неўдах, І.Я.Пехцераў, І.Р.Пяшко, Рось Алеся (Т.Р.Мазур), П.І.Сабіна, П.П.Саковіч, Л.Д.Сільнова, Снарская Іна (І.С.Дзідык), Сом Лера (А.У.Сом), В.В.Стрымкоўская, А.М.Стрыгалёў, Г.П.Тварановіч, В.У.Угрыновіч-Камінская, А.К.Цітоў, М.В.Шабовіч, У.К.Шурка, Л.Р.Шэлег. **1999**. С.Г.Адамовіч, Г.П.Аўласенка, А.М.Бабаед, В.М.Кадзетава, М.Я.Касцюкевіч, Г.М.Кісліцына, Корань Людміла (Л.Дз.Сінькова), Г.Г.Мяцеліца, В.І.Русілка, А.І.Станкевіч. **2000**. І.І.Дарафейчук, А.В.Камоцкі, Капа Наталля (Н.М.Казапалянская), В.Я.Корбут, Ф.А.Кошаль, А.А.Легастаева, В.Х.Медунецкі, Т.М.Мушынская, Л.Дз.Раманава, Г.В.Рымскі, С.Ф.Сцяпан, Хадарэнка Ірына (І.М.Шумская). **2001**. П.М.Гаспадыніч, А.І.Гінько, Т.М.Дасаева, М.М.Ждановіч, А.А.Ігнашок, І.Л.Качаткова, В.М.Кукса, Лайкоў Янка (І.У.Лайкоў), А.І.Мазько, А.Ф.Майсеенка, Л.У.Маракоў, М.У.Мікуліч, А.Ф.Мяснікоў, З.І.Падліпская, В.П.Паліканіна, М.П.Прохар, С.В.Рублеўскі, В.В.Стралко, С.В.Суднік, Супрановіч Таіса (Т.І.Гурко), Т.І.Трафімава, Чэмер Андрэй (А.С.Анішчык), І.Л.Шаўлякова, Н.Н.Шклярава, А.А.Яскевіч.

І.У.Саламевіч.

САЮ́З ВАЯЎНІ́ЧЫХ БЯЗБО́ЖНІКАЎ (СВБ), масавая атэістычная арг-цыя ў СССР у 1925—47. Створаны ў крас. 1925 на з'ездзе карэспандэнтаў газ. «Безбожник» (1922—41), да чэрв. 1929 наз. «Саюз бязбожнікаў». Вышэйшы орган — з'езд, паміж з'ездамі — Цэнтр. савет (нязменны кіраўнік Е.М.Яраслаўскі). Мэта — ідэйная барацьба з рэлігіяй ва ўсіх яе праявах праз фарміраванне ў грамадзян СССР матэрыялістычнага светапогляду. Інш. друкаваныя органы: час. «Безбожник» (1925—41), «Антирелигиозник» (1926—41), «Юные безбожники» (1931—33) і інш. У 1940 СВБ налічваў каля 3,5 млн. чл., 96 тыс. ячэек на прамысл. прадпрыемствах, у калгасах і навуч. установах. З ім супрацоўнічалі вядомыя камуністы. дзеячы Н.К.*Крупская*, А.В.*Луначарскі*, І.І.*Скварцоў-Сцяпанаў* і інш. СВБ прапагандаваў прыродазнаўчыя навук. веды, вёў індывід. атэіст. работу з вернікамі, навук. даследаванні ў галіне атэізму і крытыкі рэлігіі, выдаваў навук.-папулярную л-ру, ствараў музеі і выстаўкі. У практыцы мясц. ячэек СВБ (асабліва ў першы перыяд) мелі месца і гвалтоўныя метады: закрыццё з дазволу або па ініцыятыве ўлад храмаў, акты вандалізму, дэманстратыўныя абразы пачуццяў вернікаў. На Беларусі з 1926 існаваў СВБ БССР як рэсп. аддзяленне (да 1929 — Саюз бязбожнікаў Беларусі). У ім удзельнічалі бел. вучоныя С.Я.*Вальфсон*, І.В.Герчыкаў, М.М.*Нікольскі*, У.І.*Пічэта* і інш. З 1929 пры Белдзяржвыдавецтве існавала секцыя выданняў СВБ БССР. У 1929 2-і з'езд СВБ СССР і ЦВК СССР крытыкавалі СВБ БССР за гвалтоўныя метады дзейнасці.

З сярэдзіны 1937 у выніку *рэпрэсій палітычных* пацярпелі многія кіраўнікі і актывісты СВБ, дзейнасць Саюза пачала набываць фармальны характар, пачаўся адток членаў. У пач. Вял. Айч. вайны ў 1941 дзейнасць СВБ спынена, у 1947 ён фармальна распушчаны, яго сродкі і функцыі па прапагандзе атэізму перададзены зноў створанаму Усесаюзнаму т-ву па пашырэнні паліт. і навук. ведаў.

М.Г.Нікіцін, І.М.Чарнякевіч.

САЮ́З ВЫЗВАЛЕ́ННЯ, нелегальнае паліт. аб'яднанне ліберальнай інтэлігенцыі ў Расіі ў 1904—05. Засн. ў студз. 1904 на базе групоўкі ўтворанай вакол час. «Освобождение». Дзейнічаў у кантакце з Саюзам земцаў-канстытуцыяналістаў, у ліст. 1904 выступіў арганізатарам «банкетнай кампаніі» (120 палітызаваных банкетаў у 34 гарадах, удзельнікі якіх патрабавалі ад урада ўвядзення нар. прадстаўніцтва і паліт. свабод) і нелегальных земскіх з'ездаў. Праграма (крас. 1905) прадугледжвала ўвядзенне ў Расіі канстытуцыйнай манархіі, усеагульнага выбарчага права, частковае надзяленне сялян зямлёй. Члены саюза восенню 1905 склалі ядро *Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі.*

Літ.: Леонтович В.В. История либерализма в России, 1762—1914: Пер. с нем. 2 изд. М., 1995.

«САЮ́З ВЫЗВАЛЕ́ННЯ БЕЛАРУ́СІ» («СВБ»), справа ў 1930 ДПУ БССР супраць бел. нац. інтэлігенцыі, якую абвінавачвалі ў *нацыянал-дэмакратызме*, контррэв. і антысав. дзейнасці; першы масавы паліт. пазасудовы працэс у БССР. Вясной—летам 1930 было арыштавана 108 дзеячаў навукі і культуры Беларусі, у т.л. 25 былых членаў партыі бел. эсэраў: акадэмікі Бел. АН В.Ю.Ластоўскі, Я.Ю.Лёсік, С.М.Некрашэвіч, праф. А.А.Смоліч, наркомы земляробства (Дз.Ф.Прышчэпаў) і асветы (А.В.Баліцкі), пісьменнікі М.Гарэцкі, У.Дубоўка, Я.Пушча і інш. Кіраўніком арг-цыі «СВБ» быў «прызначаны» ДПУ БССР Ластоўскі, у склад яе кіраўніцтва «ўведзены» І.І.Краскоўскі, Я.Купала, Лёсік, Некрашэвіч, Смоліч, А.І.Цвікевіч і інш. Паводле пастановы калегіі АДПУ СССР ад 18.3.1931, Прышчэпаў, Баліцкі, нам. наркамзема А.Ф.Адамовіч і П.В.Ільючонак прыгавораны да 10 гадоў канцлагераў. Астатнія 86 чал. пастановай калегіі АДПУ ад 10.4.1931 асуджаны на розныя тэрміны зняволення: 8 чал. — на 5 гадоў, 1 — на 3 гады *папраўча-працоўных лагераў*, астатнія — на 5 гадоў высылкі ў аддаленыя раёны Сав. Саюза. Усе арыштаваныя абвінавачваліся ў тым, што «з'яўляліся членамі контррэвалюцыйнай нацыяналістычнай арганізацыі «Саюз адраджэння Беларусі», у далейшым перайменаванай у «Саюз вызвалення Беларусі», ажыццяўлялі арганізаванае шкодніцтва на культурным, ідэалагічным і іншых участках сацыялістычнага будаўніцтва, праводзілі антысавецкую нацыяналістычную агітацыю, скіраваную на запавольванне тэмпаў развіцця Беларусі на сацыялістычным

шляху, ставячы канчатковай мэтай адарванне Беларусі ў этнаграфічных межах ад Савецкага Саюза і стварэнне так званай Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР)». Амаль да ўсіх арыштаваных прымяняліся фіз. катаванні і маральна-псіхал. здзекі з мэтай атрымаць ад іх патрэбныя паказанні. Усе, хто праходзіў па справе «СВБ», зноў арыштаваны ў 1937—41 за «ранейшыя злачынствы», большасць з іх расстраляны ці загінулі ў канцлагерах. Некат. з удзельнікаў «СВБ» былі арыштаваны ў 1949—52 трэці раз і асуджаны на вечнае пасяленне ў Сібіры на той падставе, што былі асуджаны раней. Усе рэабілітаваны ў 1956—88 за адсутнасцю саставу злачынства. Матэрыялы справы «СВБ» складаюць 29 тамоў. *У.М.Міхнюк.*

САЮ́З ВЫРАТАВА́ННЯ», тайная паліт. арганізацыя *дзекабрыстаў* у 1816—17. Паводле статута (1817) наз. «Таварыства сапраўдных і верных сыноў Айчыны». Заснавальнікі: А.М. і М.М. Мураўёвы, М.І. і С.І. Мураўёвы-Апосталы, С.П.Трубяцкой, І.Дз.Якушкін, М.С.*Лунін*, Ф.П.Шахаўской, П.І.*Песцель*. Налічваў каля 30 чалавек. Мэта «С.в.» — ліквідаваць прыгонніцтва, увесці канстытуц. манархію шляхам ваен. перавароту. Чл. «С.в.» павінны былі пашыраць склад т-ва, займаць важнейшыя ваен. і цывільныя пасады, фарміраваць грамадскую думку, асабліва сярод перадавога дваранства. «Саюз» падзяляўся на 3 ступені — «баляры», «мужы» і «браты», быў арганізаваны на прынцыпах глыбокай канспірацыі і строгай дысцыпліны. У «С.в.» вылучыліся радыкальная і памяркоўная плыні. Разыходжанні ў пытаннях тактыкі, непадрыхтаванасць да рашучых дзеянняў прывялі да самароспуску «С.в.» і заснавання ў 1818 т-ва *«Саюз працвітання»*.

САЮ́З ГАРАДО́Ў, Усерасійскі саюз гарадоў, гл. ў арт. *Земска-гарадскі саюз.*

САЮ́З ДАСЯГНЕ́ННЯ РАЎНАПРА́ЎЯ ЯЎРЭ́ЯЎ У РАСІІ. Існаваў з сак. 1905 да мая 1907. На Беларусі саюз дзейнічаў у Гомелі, Мінску, Гродне і інш. гарадах і мястэчках. Устаноўчы сход адбыўся ў крас. 1905 у Вільні, створаны цэнтр. камітэт саюза, у які ўвайшлі М.Вінавер (старшыня), Ю.Гесен (сакратар), С.М.Дубноў, Г.Б.Слёзберг. Дзейнасць зводзілася да арганізац. мер для ўдзелу яўрэяў у выбарах у Дзярж. думу, прававой дапамогі яўр. насельніцтву. Чл. саюза выступалі за асіміляцыю яўрэяў у складзе Рас. імперыі (у адрозненне ад сіяністаў), за роўныя правы ў галіне адукацыі і культуры, за тэр. аўтаномію. Па нац. пытанні падтрымлівалі партыю кадэтаў. Адбыліся 4 з'езды саюза. У сак. 1906 саюз перайменаваны ў «Таварыства раўнапраўя яўрэйскага народа ў Расіі». Чл. саюза ўдзельнічалі ў выбарах у 1-ю Дзярж. думу (6 дэпутатаў увайшлі ў фракцыю кадэтаў) і 2-ю Дзярж. думу. Саюз меў друк. выданні: газ. «Еврейская жизнь» (1905—07), «Хроника еврейской жизни» (1905—06), «Еврейский выборщик» (1907). У маі 1907 саюз раскалоўся на «Яўрэйскую народную групу», Яўрэйскую нар. партыю (заснавальнік Дубноў) і сіянісцкую партыю.

Э.Р.Іофе, Э.А.Ліпецкі.

«САЮ́З ДЗЕ́ЛЯ ПРАГРЭ́СУ», праграма сац.-эканам. развіцця і паліт. пераўтварэнняў у краінах Лац. Амерыкі, якую прапанаваў прэзідэнт ЗША Дж.Ф.*Кенэдзі*. Прынята 17.8.1961 у г. Пунта-дэль-Эстэ (Уругвай) на надзвычайнай сесіі Міжамер. эканам. і сац. савета Арг-цыі амер. дзяржаў (19 краін Лац. Амерыкі і ЗША). Меў на ўвазе прадухіліць дэстабілізацыю ўнутр. становішча ў краінах рэгіёна пад уплывам *Кубінскай рэвалюцыі 1959* і быў разлічаны на 10 гадоў. Прадугледжваў фін. дапамогу краінам-удзельніцам «С.дз.П.» з боку ЗША у абмен на ажыццяўленне там эканам. і паліт. рэформ (дэмакратызацыя паліт. жыцця і інш.). Спрыяў пэўнаму эканам. прагрэсу краін Лац. Амерыкі ў 1960-я г., але не ў той меры, як разлічвалі аўтары праграмы, гал. чынам з-за супраціўлення на месцах з боку як правых, так і левых сіл.

САЮ́З ДЫЗА́ЙНЕРАЎ БЕЛАРУ́СІ, Беларускі саюз дызайнераў (БСД), грамадская творчая арг-цыя дызайнераў Беларусі. Аб'ядноўвае спецыялістаў у галінах індустр. і графічнага *дызайну*, праектавання малых форм, інтэр'еру, абсталявання, рэкламы, арт-дызайну, мадэльераў, педагогаў, тэарэтыкаў дызайну. Асн. мэты саюза: развіццё і прапаганда творчай дзейнасці дызайнераў, абарона аўтарскіх правоў, прафес., эканам. і сац. інтарэсаў; павышэнне эфектыўнасці ўкладу дызайну ў развіццё культуры і эканомікі краіны. Створаны ў 1987 на ўстаноўчым з'ездзе дызайнераў Беларусі як С.д.Б. З 1999 наз. Бел. саюз дызайнераў. У 1991 на пазачарговым устаноўчым з'ездзе дызайнераў Рэспублікі Беларусь прыняты новы статут, уведзены пасады прэзідэнта і віцэ-прэзідэнта. Наступныя з'езды адбыліся ў 1993, 1995 (пашыраны сход), 1999. У 1987—95 старшыня праўлення саюза — А.Длатоўскі, з 1995 прэзідэнт БСД — Дз.Сурскі. У БСД зарэгістраваны 2 абл. аддзяленні — Гродзенскае і Віцебскае. БСД — чл. міжнар. асацыяцыі «Саюз дызайнераў» і асацыяцыі грамадскіх аб'яднанняў «Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў». Саюз выпускае выданне «PRO дизайн» (з 2001). На 2001 у БСД 470 чл.

Члены Беларускага саюза дызайнераў

1987. Л.І.Агібалаў, Н.М.Астапенка, Ю.І.Базнікін, А.А.Барташэвіч, В.Э.Бартлаў, А.П.Блінцоў, У.В.Булгакаў, М.У.Бялоў, Ф.Р.Вількін, А.П.Волкаў, Л.У.Гальперын, К.М.Гардзееў, М.Я.Гармацько, У.А.Гаругін, В.Р.Гаругіна (Бека), І.Я.Герасіменка, У.Б.Гераўкер, Т.А.Голубева, Б.Н.Грубін, М.М.Грыбаў, Я.М.Грыгор'еў, В.М.Гур'еў, С.М.Гурыновіч, Ю.В.Далгачоўскі, Л.А.Дарбінян, І.А.Дзямкоўскі, А.Г.Длатоўскі, А.Ф.Елісееў, У.С.Жаркевіч, Л.В.Кажура, Л.А.Карнеева, Л.А.Кізіл, В.В.Кісялёва, В.І.Кісялёў, Р.М.Клімін, Л.С.Краўчыня, А.В.Крывёнак, Л.Н.Кульпіна, Н.Р.Кушнікава, В.А.Ламака, Я.Ю.Ленсу, З.М.Лібстэр, М.І.Ліўшыц, К.Б.Лыцін, У.С.Майсееў, В.М.Манін, А.П.Марозаў, Н.К.Махнач, А.Р.Мельнікаў, М.С.Нізоўцаў, Ю.У.Падгорнаў, С.Ф.Паланевіч, Л.В.Папуцьева, А.Е.Пастухоў, У.І.Паўлоўскі, В.М.Плаксін, М.У.Пратасаў, Н.І.Прышчэп, М.С.Пупко, В.А.Ражноў, В.М.Разоўскі, А.У.Ружо, В.В.Рысакоў, Л.А.Сабалеўская, А.В.Сандрыгайла, М.А.Скарасцецкі, М.М.Скварцоў, В.М.Старавойтаў, І.В. Старавойтаў, М.В.Стас, М.І.Сугака, Л.В.Тарасава, У.П.Трафіменка, А.В.Цэхановіч, У.І.Цярэнцьеў, Л.А.Чарнышова, А.В.Чарнышоў, В.П.Шагавік, У.І.Шолк, І.У.Яркова. **1988**. Г.А.Аксёнава, С.П.Выдранкова, Н.П.Кальхалава, М.Г.Лагунова, Л.І.Мялоў, Р.М.Найдзен, М.Дз.Падалец, С.У.Стальмашонак, Дз.А.Сурскі. **1989**. А.В.Барысаў, І.Б.Булгакава, С.У.Саркісаў, Л.Ф.Чупрына, А.А.Шакіраў, В.У.Яцкоўскі. **1990**. В.У.Быкаў, В.В.Бяссонаў, С.У.Кукуруза, В.У.Кулянёнак, Т.Г.Леўніна, А.Г.Малін, А.П.Панамарэнка, У.І.Партолін, Т.Я.Собаль, І.П.Чухраеў. **1991**. Ф.Э.Алібекаў, Р.К.Камышава, А.П.Крывашэеў, В.А.Ламака, М.Я.Мішчанка, М.А.Новік, В.М.Свіягін, В.Л.Сонца. **1992**. М.М.Акалот, А.В.Барысаў, Л.Я.Дзягілеў, А.М.Крупец, Г.С.Масяеўская, Р.С.Салаўёва, Г.М.Шакавец. **1993**. А.В.Гапіенка, Л.С.Гусева, І.В.Куржалаў, А.Ю.Семянцоў, А.П.Таранда. **1994**. А.Р.Вышка, Я.П.Клепікаў, Н.Р.Коўш, К.У.Мезіт, Я.Р.Пільнік, В.Я.Семянько, А.М.Сняжко. **1995**. С.В.Войчанка, Э.Э.Жакевіч, М.М.Камароўская, Т.П.Кузюкова, К.А.Пакаліцына, У.Я.Цэслер, А.А.Штанько. **1996**. Р.В.Азарын, У.М.Берташ, В.У.Галаванаў, Г.М.Гоманава, А.Б.Грубін, С.М.Гулецкі, А.Г.Дашкевіч, Э.Л.Дашчынская, Г.С.Дзвірнык, Э.А.Жвікава, І.Л.Ідэльчык, М.Б.Какаулін, І.Л.Корзун, В.І.Кралявец, А.С.Крывенка, Н.У.Кузьмянкова, Т.В.Лісавенка, Дз.Р.Маслій, І.В.Мацкевіч, Г.Я.Мяшкова, М.М.Ніцэвіч, А.Г.Піскуноў, І.М.Полазава, В.А.Рагалевіч, І.М.Сак, В.В.Сафонаў, А.У.Смірнова, Т.Я.Сымановіч, А.Г.Угляніца, Н.В.Федасеенка, І.У.Халадзінскі, А.М.Шкаева, А.С.Шышко, С.І.Ярохін, В.М.Ярэська, С.К.Яўлампіеў. **1997**. А.П.Азончык, В.В.Алякseенка, М.У.Анемпадзістаў, В.П.Аніськова, С.С.Ануфрыева, В.В.Аржанухіна, М.У.Арысава, В.Р.Астахновіч, Г.Я.Балаш, Л.М.Баршчова, В.У.Бугаенка, К.У.Булгакава, І.І.Бурак, А.Л.Васіленя, А.Э.Васільеў, А.В.Галімскі, С.Р.Давыдзенка, Ю.А.Дарашкевіч, Н.В.Дзмітрыева, А.В.Дзмітрыеў, А.У.Дзмітраў, А.М.Дольнікаў, В.Л.Захарава, Ю.А.Захараў, І.Г.Казюлькаў, А.В.Каласоўскі, І.С.Канчатава, М.А.Капілава, Т.С.Карака, Т.В.Карымава, І.М.Кендзянкоў, А.Дз.Крыпская, Ю.Я.Кубараў, Дз.В.Кулагін, А.І.Кулікоў, Дз.І.Кухарчык, А.С.Ламанос, У.І.Лісавенка, Р.А.Макараў, М.В.Макарэвіч, Т.І.Макляцова, В.Р.Марчанка, В.П.Масквіна, Н.У.Мінкевіч, А.В.Міхалевіч, Ю.В.Мурашоў, А.П.Наважылаў, І.Я.Налімава, С.У.Нечунаева, П.А.Новікаў, В.А.Някрасава, Ю.І.Паддубскі, Л.В.Папкоўская (Тараканава), Н.В.Пастухова, С.Я.Плотнікаў, І.І.Пукшліс, Ю.А.Пятрова, А.Б.Пятроў, А.У.Рудая, К.Я.Сакалоў, Я.М.Саковіч, А.Ф.Скамарошчанка, Н.М.Скамарошчанка, К.У.Скварцоў, Т.М.Старыкава, А.Р.Сяргеева, М.М.Трапацкі, В.І.Трусаў, К.А.Філюта, А.М.Хількевіч, А.Я.Чарвінская, А.А.Шмялёва, А.В.Шэлегава, А.Н.Яніцкі. **1998**. В.А.Азямблоўскі, І.У.Айплатаў, С.А.Аксінь, Ж.Р.Баравец, І.Я.Бруснікіна, Ю.Л.Брэўс, В.М.Валькоўскі, А.У.Варахобка, І.А.Варкулевіч, А.Б.Віхрова, К.С.Вязьмікін, Т.В.Гардашнікава, Т.М.Гарыдавец, У.У.Голубеў, Ж.Г.Грак, А.А.Гурыновіч, Т.П.Гушча, А.М.Дзямідаў, А.І.Забаўчык, А.У.Забела, В.У.Зайцаў, А.У.Кажухар, А.Б.Кажухоўская, Г.В.Казарноўская, В.Л.Каленік, С.А.Карнільева, Р.В.Касануэва, І.В.Красоцкая, У.В.Круглік, С.М.Крупская, М.І.Кулак, М.В.Кушнікаў, А.В.Лапін, З.А.Лу-

цэвіч, Т.М.Луцаіковіч, А.А.Малахоўскі, М.М.Маруга, Дз.В.Мурашоў, Т.В.Нагавіцына, А.М.Налівайка, В.М.Нікалаеў, А.В.Нікішын, С.В.Ольвінскі, С.Ф.Осіпаў, С.І.Пажарыцкі, П.Я.Палянскі, В.У.Папковіч, А.П.Папоў, Н.Л.Петракоўская, С.Я.Пятроў, М.М.Радава, С.В.Сайко, П.М.Салаўёў, У.У.Сарока, В.А.Сарокін, І.Ф.Селязнёў, Ю.Я.Собалеў, В.В.Старынская, В.Р.Стас, К.А.Стрыкелёва, А.А.Сурскі, А.А.Сцяпнёнак, У.С.Сямёнаў, Т.Ф.Табунова, Л.І.Талбузін, Н.І.Тарабука, В.Л.Тарэева, Ю.А.Тарэеў, А.А.Трухан, В.А.Філюта, Л.Д.Фінкельштэйн, Дз.Р.Чалей, П.У.Шкурэнка, А.В.Шчукін, С.В.Эляневіч. **1999**. С.Дз.Алейнік, І.В.Андрасюк, М.Р.Баразна, М.У.Баран, А.М.Варанко, В.М.Варэнікава, М.Л.Ганчарук, А.С.Гаўрылаў, С.П.Гусельцаў, Т.Л.Дольская, М.В.Драко, П.П.Ермашкевіч, Г.У.Жаркевіч, А.А.Жданоўская, В.К.Зайцаў, А.Я.Захарэвіч, С.І.Зенчанка, К.У.Калашнікава, А.М.Калугіна, А.А.Канцадайлава, Я.М.Карава, Ю.С.Каштанаў, І.Л.Кірылава, І.В.Кукса, А.А.Кулажэнка, Т.П.Кулажэнка, І.В.Курыльчык, А.Я.Лабовіч, Л.М.Лазоўская, В.І.Латушкін, Дз.І.Латушкін, А.А.Ленсу, Ю.А.Лукомскі, В.А.Ляўчэня, Н.П.Мартынава, М.А.Міронаў, В.Р.Міхеева, А.У.Навуменка, С.Г.Наздрын-Платніцкая, Н.Л.Наўроцкая, Г.В.Нікіціна, Т.П.Осіпава, А.У.Панькоўскі, А.У.Працэнка, Н.К.Пятрова, Ю.У.Рудых, І.Я.Рыжкова, В.В.Сакалова, А.М.Саладзілава, Дз.П.Саладзілаў, А.Л.Самовіч, В.Я.Санько, Т.М.Свістунова, П.А.Семчанка, І.В.Сідаровіч, А.Ю.Строганаў, Г.І.Строцава, Дз.Ю.Строцаў, У.П.Федарэц, В.У.Фралова, В.Р.Фурман, Н.І.Харольская, І.П.Хіцько, Р.В.Ціхановіч, В.А.Цэхановіч, С.В.Чарановіч, С.Дз.Чыркоў, В.М.Шаргу, М.Ф.Шклярaў, П.С.Яршч, А.М.Ярковіч, Т.М.Яфрэмава. **2000**. В.П.Алейнік, К.Р.Алейнік, Н.М.Аляксеева, М.В.Аржанухіна, І.У.Аўсіевіч, А.А.Бандарэнка, С.А.Баранкоўская, І.А.Барсукоў, К.У.Блахін, У.В.Бугакаў, А.У.Бялоў, Л.У.Бярозкіна, К.Г.Вашчанка, М.Г.Галынская, І.Г.Дзёміна, У.М.Дымент, Г.У.Жаркевіч, А.В.Жураўлёў, М.І.Жых, І.М.Зносак, М.Б.Іслямаў, А.А.Кабанаў, Э.М.Казачэнка, Т.У.Казлова, В.І.Калечыц, С.У.Калтовіч, К.К.Камароўская, Ж.А.Капуснікава, Г.Б.Каралёва, М.У.Кончыц, Т.І.Косікава, А.У.Косікаў, Г.Л.Ліхтаровіч, Р.І.Макейчык, В.Б.Мар'янкоў, Ю.М.Матусевіч, А.А.Міт, Л.Я.Нішчык, С.Л.Піліповіч, Н.І.Піневіч, А.У.Плакучаў, Ю.Г.Планкін, У.І.Прыгарніцкі, У.К.Рута, А.А.Савелічава, А.Л.Самовіч, А.В.Свецік, М.С.Свечнікава, В.А.Сядых, В.А.Федарэнка, С.А.Філіпаў, Л.В.Халамава, У.Ю.Шавардзін, В.Э.Шапавалава. **2001**. Н.В.Аўчарэнка, С.У.Бузун, А.У.Дамнянкоў, А.В.Жукава, А.У.Іванова, А.В.Канавалаў, А.А.Карабко, С.А.Кляцоў, Ю.Э.Круш, Л.В.Кухаронак, Р.Б.Лядэнка, А.М.Матросава, К.М.Міхееў, В.У.Пасюкевіч, І.У.Працко, Л.А.Стрыжак, А.А.Цакаленка, Л.Б.Церах, А.В.Цынкалаў, Т.У.Язерская.

Літ.: Белорусский союз дизайнеров: Справ. Мн., 1999. *Т.Р.Мартыненка.*

САЮЗ ЖУРНАЛІСТАЎ БЕЛАРУСІ, Беларускі саюз журналістаў, добраахвотная грамадская арганізацыя прафес. работнікаў перыяд. друку, тэлебачання, радыёвяшчання, інфарм. агенцтваў, выдавецтваў. Створаны ў 1959 як С.ж.Б. З 1995 наз. Бел. саюз журналістаў. Гал. задачы саюза — павышэнне прафес. майстэрства журналістаў, іх кругагляду і абагульненне лепшага вопыту. Арганізоўвае творчыя семінары, стажыроўку маладых журналістаў, прэс-канферэнцыі, творчыя конкурсы, выстаўкі. Членамі саюза могуць быць журналісты, фотакарэспандэнты, мастакі, рэдактары, якія працуюць у друку, на радыё і тэлебачанні, у інфарм. агенцтвах не менш як 3 гады і валодаюць высокім прафес. майстэрствам. Вышэйшы орган — рэсп. з'езд. Паміж з'ездамі дзейнасцю саюза кіруе сакратарыят і рада. З'езды адбыліся ў 1959, 1962, 1966, 1971, 1977, 1982, 1987, 1990, 1995, 2000. Дзейнасць С.ж.Б. распаўсюджваецца на тэр. Рэспублікі Беларусь. У абласцях створаны абласныя журналісцкія арг-цыі, у рэдакцыях — пярвічныя. Уваходзіць у склад Міжнар. канфедэрацыі журналісцкіх саюзаў. Яго прадстаўнікі ўдзельнічаюць у міжнар. сустрэчах і сімпозіумах журналістаў, арганізоўваюць аналагічныя мерапрыемствы на Беларусі, спрыяюць умацаванню супрацоўніцтва і абмену вопытам паміж сродкамі масавай інфармацыі розных краін свету. Выдае газ. «Вдохновение». Старшыні С.ж.Б.: Ф.Я.Кляцкоў (1959—71), У.В.Мацвееў (1971—73), А.А.Тоўсцік (1973—87), І.П.Макаловіч (1987—90), Л.С.Екель (з 1990). На 1.9.2001 аб'ядноўвае 2500 чл.

Т.М.Мазур.

САЮЗ ЗЯМЕЛЬНЫХ УЛАСНІКАЎ, палітычная арганізацыя памешчыкаў Расіі ў 1905—08 і 1916—20. Засн. ў ліст. 1905 у С.-Пецярбургу для абароны буйнога прыватнага землеўладання і самадзярж. ладу ва ўмовах рэвалюцыі 1905—07. Пасля яе задушэння часова спыніў існаванне (1908). Адноўлены ў ліст. 1916 з мэтай дапамогі арміі с.-г. прадуктамі і абароны прыватнай уласнасці на зямлю. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 С.з. у. — падп. манархічная арг-цыя, звязаная з белым рухам. Адзін з яго кіраўнікоў А.В.Крывашэін у 1920 узначальваў белагвардзейскі «Урад Поўдня Расіі». Пасля разгрому Чырв. Арміяй асн. сіл белагвардзейцаў саюз распаўся.

САЮЗ КАМПАЗІТАРАЎ БЕЛАРУСІ, Беларускі саюз кампазітараў, добраахвотная грамадская творчая арганізацыя кампазітараў і музыказнаўцаў Беларусі. Створаны ў 1933 як аўт. секцыя пры Саюзе пісьменнікаў Беларусі. У 1934 адбылася 1-я Усебел. канферэнцыя кампазітараў, паводле пастановы якой секцыя кампазітараў перайменавана ў Аргкамітэт С.к.Б. (з 1938 Саюз сав. кампазітараў Беларусі). З 1957 наз. С.к.Б., з 1999 — Бел. саюз кампазітараў (БСК). Да 1992 уваходзіў у Саюз кампазітараў СССР. Асн. мэты: удзел у развіцці бел. муз. мастацтва, садзейнічанне стварэнню і прапагандзе высокамаст. муз. твораў, павышэнню творчага росту і прафес. майстэрства кампазітараў і музыказнаўцаў на аснове развіцця лепшых традыцый нац. муз. культуры. Вышэйшы кіруючы орган — з'езд кампазітараў Беларусі, выканаўчы — праўленне БСК. З'езды саюза адбыліся ў 1947, 1956, 1959, 1962, 1966, 1971, 1976, 1980, 1984, 1989, 1993, 1998, 2002. Старшыні праўлення: І.І.Любан (1932—38), А.В.Багатыроў (1938—49), М.І.Аладаў (1949—50), Я.К.Цікоцкі (1950—63), Дз.Р.Камінскі (1963—66), Р.Р.Шырма (1966—78), Ю.У.Семяняка (1978—80), І.М.Лучанок (з 1980). Праўленне праводзіць пленумы, на якіх абмяркоўваюцца праблемы творчага жыцця, пытанні развіцця муз. творчасці і музыказнаўства, наладжвае праслухоўванне і абмеркаванне новых твораў. Дзейнічаюць камісіі: прапаганды бел. музыкі (наладжвае канцэрты-сустрэчы кампазітараў са слухачамі, сувязі з замежнымі саюзамі кампазітараў і творчымі арг-цыямі), ваен.-патрыят. музыкі, муз.-эстэт. выхавання дзяцей і юнацтва, музыказнаўства і крытыкі, этнамузыказнаўства і фальклору. БСК — адзін з заснавальнікаў міжнар. фестываляў «Славянскі базар», «XXI стагоддзе — музыка надзеі», нац. — «Музыка і тэатр», міжнар. конкурсу юных кампазітараў «Надзея». Прымаў удзел у дэкадах бел. мастацтва ў Маскве (1940, 1955, 1987, 2000) з паказам новых бел. опер, балетаў, буйн. муз. твораў бел. кампазітараў, у днях бел. культуры на Украіне, Узбекістане, Літве. У складзе БСК дзейнічае Бел. асацыяцыя сучаснай музыкі (прэзідэнты: з 1990 А.Б.Сонін, з 1995 В.У.Кузняцоў, з 2001 Дз.В.Лыбін) — член Міжнар. асацыяцыі сучаснай музыкі (з 1992), заснавальнік Міжнар. фестывалю сучаснай камернай музыкі (1991, 1993, 1995). На 1.10.2001 у саюзе 121 член.

Члены Беларускага саюза кампазітараў.

1932. М.І.Аладаў, Ю.М.Дрэйзін, І.І.Любан, М.Ф.Мацісон, С.У.Палонскі, Р.К.Пукст, Н.Ф.Сакалоўскі, А.Я.Туранкоў, У.В.Тэраўскі, Я.К.Цікоцкі, М.М.Чуркін, Т.А.Шнітман, А.А.Ягораў, В.А.Яфімаў. **1933**. А.В.Багатыроў. **1934**. М.Я.Крошнер, П.П.Падкавыраў, А.М.Папоў. **1937**. Дз.А.Лукас, Б.С.Смольскі. **1939**. А.К.Клумаў, Л.С.Мухарынская, М.Э.Шнейдэрман. **1940**. У.У.Алоўнікаў, І.Столаў, М.Р.Шыфрын. **1941**. Дз.Р.Камінскі. **1944**. Л.М.Абеліёвіч, С.Г.Нісневіч. **1946**. І.Г.Нісневіч, Г.І.Цітовіч, Р.Р.Шырма. **1948**. Я.К.Цікоцкі. **1949**. Г.М.Вагнер. **1951**. Р.А.Анчыкаў, М.А.Русін. **1952**. І.І.Жыновіч. **1954**. Э.М.Тырманд. **1955**. Я.А.Глебаў, І.І.Кузняцоў. **1957**. С.С.Аксакаў, Я.Р.Дзягцярык, Ю.У.Семяняка. **1958**. Р.П.Бутвілоўскі, А.Я.Ракава, В.А.Сізко, У.І.Чараднічэнка. **1959**. Г.С.Глушчанка, К.І.Сцепанцэвіч. **1961**. Т.А.Дубкова, Дз.Б.Смольскі. **1962**. Л.Д.Аўэрбах, Ю.Д.Бяльзацкі, Т.А.Шчарбакова. **1964**. С.А.Картэс. **1965**. А.Б.Ладыгіна, І.М.Лучанок, Н.М.Юдзеніч. **1967**. Дз.М.Жураўлёў, К.Дз.Цесакоў, А.Р.Янчанка. **1970**. Я.Я.Касалапаў, А.Ю.Мдывані, Р.Ф.Сурус. **1971**. Ю.В.Грыгор'еў, Э.Б.Зарыцкі, З.Я.Мажэйка, Ф.Дз.Пыталеў. **1973**. Э.А.Казачкоў. **1974**. В.А.Войцік, Л.К.Захлеўны, Э.С.Ханок, Л.К.Шлег. **1975**. А.М.Зарубка. **1977**. У.І.Буднік, У.В.Дарохін, В.К.Іваноў, У.В.Прохараў. **1978**. Р.М.Аладава, А.А.Друкт, А.Б.Залётнеў, І.І.Зубрыч, В.П.Помазаў, А.Б.Сонін, В.В.Сярых, Н.М.Усцінава. **1979**. Г.К.Гарэлава, Л.М.Гуцін, В.І.Карэтнікаў, Л.Ф.Мурашка, Л.І.Свердэль. **1980**. У.В.Браілоўскі, М.Дз.Васючкоў, А.Я.Гураў, У.А.Дамарацкі, У.П.Кандрусевіч, М.К.Літвін, У.А.Палуэктаў, У.Я.Солтан, А.М.Чыркун. **1981**. Т.Б.Варфаламеева, А.В.Клеванец, А.А.Кочын, В.П.Савіцкая, Р.І.Сергіенка, Л.А.Сцяпура. **1982**. П.П.Альхімовіч, А.М.Елісеенкаў, Н.А.Калеснікава, В.П.Раінчык. **1983**. І.У.Хадоска. **1984**. Н.У.Аляксандрава. **1985**. А.В.Бандарэнка, В.М.Капыцько, Л.П.Касцюкавец, В.У.Кузняцоў, У.М.Кур'ян, Э.В.Наско, А.У.Рашчынскі. **1986**. В.В.Кандрасюк, У.Г.Мулявін. **1987**. С.П.Бельцюкоў,

М.Г.Марозава, А.Р.Навахрост, А.Б.Смольскі. **1988**. Т.Г.Мдывані, А.І.Хадоска, С.М.Хвашчынскі. **1989**. Ш.А.Ісхакбаева, Я.У.Паплаўскі, С.І.Янковіч. **1990**. Т.С.Якіменка, Дз.А.Яўтуховіч. **1991**. А.А.Барзова, Н.Я.Бунцэвіч, У.А.Грушэўскі, А.І.Дзмітрыеў, У.У.Карызна, А.Ф.Літвіноўскі, С.В.Наско, Т.П.Песнякевіч, А.С.Шушкевіч, Э.А.Язерская. **1992**. Э.А.Алейнікава, А.І.Буцько, А.М.Гулай, У.М.Каральчук. **1993**. Л.А.Барадзіна, Н.А.Голубева, У.М.Грышкевіч, Дз.М.Даўгалёў, Л.І.Сімаковіч, І.М.Цвяткова. **1994**. Г.А.Ермачэнкаў, Дз.В.Лыбін. **1996**. А.І.Безенсон, Г.І.Кароткіна. **1997**. А.В.Атрашкевіч, Р.Я.Глебаў, У.М.Саўчык, Н.А.Юўчанка, П.В.Яроменка. **1998**. Э.У.Андрэенка, У.А.Бабкоў, У.І.Гаркуша, М.В.Калекша, Л.С.Мітаковіч, Я.К.Паплаўская, Г.І.Сасноўскі, Г.В.Таўлай, В.В.Шлеянкоў. **1999**. І.К.Аслёзава, А.В.Іваноў, Н.А.Ролік. **2000**. В.А.Антаневіч, Р.П.Апановіч, В.В.Воранаў.

Н.Я.Бунцэвіч, Дз.М.Жураўлёў.

САЮ́З КАМУНІ́СТАЎ, першая міжнар. камуніст. арг-цыя, якая нелегальна існавала ў сярэдзіне 19 ст.; папярэднік *Інтэрнацыянала 1-га*. Засн. ў Лондане 2—9.6.1847 Ф.*Энгельсам*, В.Вольфам і інш. на кангрэсе *«Саюза справядлівых»*, рэарганізаванага ў С.к. Стаў цэнтрам прапаганды *марксізму*, барацьбы К.*Маркса* і Энгельса супраць *утапічнага сацыялізму* і *сектанцтва* (выключаны прыхільнікі В.*Вейтлінга*). Паводле статута (прыняты на 2-м кангрэсе ў Лондане 29.11—8.12.1847) гал. мэта саюза — звяржэнне панавання буржуазіі, усталяванне ўлады пралетарыяту, заснаванне грамадства без класаў і прыватнай уласнасці. Дэвіз арг-цыі — прапанаваны Марксам заклік «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» (замест б. дэвіза «Саюза справядлівых» «Усе людзі — браты!»), праграма — «Маніфест Камуністычнай партыі», напісаны Марксам і Энгельсам у пач. 1848.

Будаваўся на прынцыпах выбарнасці кіраўнікоў у спалучэнні з цэнтралізмам. Пярвічныя арг-цыі (абшчыны) аб'ядноўваліся ў акругі на чале з акруговымі к-тамі. Вярх. орган — кангрэс, паміж кангрэсамі выканаўчую ўладу ажыццяўляў ЦК. Налічваў каля 400 чл., пераважна ням. рабочых-эмігрантаў. Апіраўся на легальныя рабочыя т-вы і асацыяцыі ў Бруселі, Лондане, Парыжы, Германіі і Швейцарыі. Кантактаваў з англ. чартыстамі (гл. *Чартызм*) і франц. бланкістамі (гл. ў арт. *Бланкі* Л.А.). Яго члены ўдзельнічалі ў агульнаеўрап. рэвалюцыі 1848—49. Распушчаны згодна з прапановай Маркса пасля інспіраванага прускімі ўладамі працэсу супраць камуністаў у г. Кёльн (Германія, 1852).

Літ.: Союз коммунистов — предшественник I Интернационала. М., 1964; Союз коммунистов, 1836—1849: Сб. док. М., 1977.

У.Я.Калаткоў.

САЮ́З КІНЕМАТАГРАФІ́СТАЎ БЕЛАРУ́СІ, Беларускі саюз кінематаграфістаў, добраахвотная грамадская творчая арганізацыя дзеячаў кінамастацтва Рэспублікі Беларусь (сцэнарыстаў, рэжысёраў, аператараў, мастакоў, акцёраў, кіназнаўцаў, крытыкаў, арганізатараў кінавытворчасці і інш.). Мае на мэце садзейнічаць развіццю нац. кінамастацтва, росту эстэт., маральнай і духоўнай культуры грамадства, арганізацыі інтэлектуальна-творчага асяроддзя і ўмоў для стварэння маст., дакумент. і анімацыйных фільмаў. Створаны ў ліст. 1962 на 1-м установчым з'ездзе кінематаграфістаў Беларусі (аргкамітэт засн. ў ліст. 1957) як С.к.Б. З 1999 наз. Бел. саюз кампазітараў. Вышэйшы кіруючы орган — з'езд кінематаграфістаў Беларусі, выканаўчы — праўленне. З'езды адбыліся ў 1967, 1971, 1976, 1981, 1986, 1991, 1994, 1997, 1998, 2000. Першыя сакратары праўлення: У.Корш-Саблін (1957—74), І.Дабралюбаў (1974—76), В.Тураў (1976—81), А.Карпаў (1981—86), В.Нікіфараў (1986—91); старшыні: А.Красінскі, Нікіфараў (1991—94), Красінскі (1994—97), І.Воўчак (1997—2000), Ю.Марухін (з 2000). Праводзіць фестывалі, канферэнцыі, семінары, творчыя сустрэчы, абмеркаванні фільмаў, займаецца матэрыяльна-быт. пытаннямі, абараняе прафес. інтарэсы і правы кінематаграфістаў. Мае гільдыі (кінарэжысёраў, кінааператараў, акцёраў), секцыі і камісіі (маладых кінематаграфістаў, ветэранаў, арганізатараў вытв-сці, сацыяльна-быт.), дырэкцыю фестывальных праграм, з'яўляецца заснавальнікам шэрагу самаст. студый. Уваходзіць у Бел. канфедэрацыю творчых саюзаў і Канфедэрацыю саюзаў кінематаграфістаў краін СНД і Прыбалтыкі. У чэрв. 1999 перайменаваны ў Рэсп. грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз кінематаграфістаў». На 5.2.2002 у саюзе 362 члены.

Члены Беларускага саюза кінематаграфістаў

1957. У.Л.Акуліч, Т.Н.Аляксеева, К.Г.Бак, У.П.Белавусаў, М.З.Бераў, М.М.Блісцінаў, Е.Л.Бондарава, С.М.Браўдэ, Н.У.Брыльянтшчыкава, А.А.Булінскі, Ю.А.Булычоў, І.Н.Вейняровіч, Е.М.Ганкін, М.І.Гарбуноў, Л.У.Голуб, К.Л.Губарэвіч, У.У.Корш-Саблін, А.А.Куляшоў, Л.І.Матусевіч, І.Ц.Пікман, В.П.Смоляр, С.І.Сплашноў, М.А.Стальмакова, У.М.Стральцоў, В.Ц.Тураў, Г.Я.Удавянкоў, М.П.Фрайман, С.Р.Фрыд, У.П.Цяслюк. **1958**. П.С.Васілеўскі, А.Я.Карпаў, Б.К.Сарахатунаў. **1959**. А.Е.Кучар, У.А.Пужэвіч, Я.П.Сакалоў, П.П.Шамшур, В.М.Шаталаў. **1960**. А.Ц.Аўдзееў. **1961**. М.Дз.Ведзянееў, М.Лужанін (А.А.Каратай), Р.І.Масальскі, Б.М.Сцяпанаў. **1962**. Ю.П.Альбіцкі, В.М.Дзёмкін, В.Р.Карпілаў, Г.Л.Лейбман, І.К.Рамішэўскі, С.І.Тульман, У.С.Усціменка, І.Л.Хазанская, Р.З.Ясінскі. **1963**. Р.І.Глухоўскі, А.В.Красінскі, В.І.Смаль, У.Дз.Станкевіч, Г.П.Тарасевіч. **1964**. В.С.Анціпаў, М.В.Бярковіч, У.А.Дзяменцьеў, Я.А.Ігнацьеў, Ю.А.Марухін, Ч.І.Цяўлоўскі. **1965**. Ю.М.Дубровін, А.А.Жук, Ю.Я.Збоеў, В.А.Поршнеў, В.М.Сукманаў. **1966**. В.А.Арлоў, С.Н.Вейняровіч, І.М.Дабралюбаў, М.Б.Дзодзіева, Ю.В.Лысятаў, С.І.Міхліна, В.Я.Нікалаеў, Б.А.Папоў, А.М.Парыцкі, Ю.Л.Рыбчонак, Н.П.Сава, Б.С.Смірноў, Ю.М.Цвяткоў, В.П.Чацверыкоў. **1967**. Г.С.Бекарэвіч, А.М.Браілоўскі, А.М.Бычкоўскі, Л.Р.Вежнявец, У.Э.Іваноўскі, Ю.М.Іванцоў, Б.Ф.Кавецкі, Р.Я.Кобец, В.Г.Кубараў, А.І.Лазіцкі, У.А.Пранько, І.А.Рудамётаў, Л.Р.Румянцава, М.С.Юрэвіч. **1968**. В.П.Алешка, Г.А.Дубровіна. **1969**. А.У.Грыбава, В.Н.Дашук, М.К.Заслонава, М.А.Калінін, У.Я.Карасёў, В.Ф.Нячай, С.У.Пятроўскі, Г.Ф.Таран, А.Дз.Ястрабаў. **1970**. Дз.Я.Зайцаў, А.С.Ігішаў. **1971**. П.К.Аліфярэнка, Э.І.Гайдук, А.М.Іваноў, П.В.Кармунін, А.І.Клімава, В.П.Тарасаў, Б.А.Шангін, Р.І.Янкоўскі, М.М.Яроменка. **1972**. Б.А.Аліфер, У.Я.Гарбачоў, Л.В.Емяльянаў, Ф.Я.Конеў, Ф.М.Осіпаў, А.І.Сіманаў, Р.Р.Храпуцкі. **1973**. С.І.Шухман. **1974**. І.П.Афанасьеў, А.А.Дзялендзік, Л.У.Мартынюк, Э.А.Мілова, С.Дз.Міхайлава, В.А.Нікіфараў, С.Г.Палякоў, У.Ф.Паначэўны, Э.Н.Садрыеў, У.У.Цяслюк, Р.М.Шмыроў. **1975**. Н.А.Жукоўская, І.І.Каваленка, С.І.Канавалаў, Ф.А.Кучар, С.П.Лук'янчыкаў, Дз.Н.Міхлееў, Г.Р.Рагачова, В.Д.Рубінчык, С.І.Сухавей, С.П.Турава, І.І.Шышоў. **1976**. А.І.Алай, В.Р.Бірукоў, М.С.Браўдэ, Р.Г.Гольдберг-Раманаў, А.П.Дзянісаў, Г.В.Ратнікаў. **1977**. А.М.Адамовіч, Н.Т.Жыжаль, А.Я.Кавецкая, І.В.Калоўскі, А.П.Колас, К.С.Красніцкі, В.Я.Купрыянаў, Т.Дз.Логінава, А.Л.Мілаванаў, М.М.Пташук, В.П.Рыбараў, Э.Р.Сямёнава, В.Л.Сяргееў, С.В.Урусаў, У.Т.Халіп, У.Ф.Чарнышоў, А.І.Чартовіч. **1978**. У.А.Арлоў, Г.С.Аўсяннікаў, В.Р.Басаў, І.Д.Белавус, В.С.Белахвосцік, В.Дз.Булавіна, У.Ф.Васінеўскі, Г.П.Гірава, А.В.Зубрыцкі, М.А.Карпук, А.У.Кляйменаў, А.М.Крукоўскі, М.М.Мартынюк, В.М.Назараў, Н.А.Суханава. **1979**. А.П.Бабкова, Ю.С.Бароўскі, М.А.Жданоўскі, А.А.Карпаў, У.П.Папоў, С.С.Пахіленка, С.Д.Цярэшчанка, А.В.Яфрэмаў. **1980**. А.П.Белавусаў, А.С.Бяспалы, Я.К.Вайтовіч, Л.В.Гедравічус, В.П.Гроднікаў, У.У.Грыцэўскі, Р.А.Гушчына, Я.І.Крупеня, А.І.Мацвяйчук, Р.З.Мірскі, Т.Т.Мужэнка, Л.А.Нячаеў, І.Л.Пісьменная, Н.У.Розанцава, Л.А.Рэніч, У.Л.Січкар, А.А.Сярбантаў, В.В.Шанько, П.П.Юрчанкоў, Л.П.Яршоў. **1981**. У.В.Гасцюхін, У.І.Гаўрыкаў, В.С.Морс, Ю.М.Плюшчаў, С.М.Станюта, А.І.Шклярэўскі. **1982**. А.М.Аржылоўскі, І.Дз.Кавелашвілі, І.І.Мацкевіч, М.Я.Пяцігорская, Л.Б.Шчаглоў. **1983**. А.І.Бецеў, Л.М.Гарохава, Ю.М.Гарулёў, В.Ф.Жыгалка, С.А.Картэс, А.А.Салавей, Ю.А.Санжарэўскі, У.І.Святлоў, Л.Н.Слобін, І.В.Тапілін, Н.Ц.Фральцова, Б.К.Шадурскі. **1984**. А.Л.Верашчагін, С.А.Гайдук, Г.М.Гарбук, Б.М.Гарошка, У.А.Калашнікаў, А.І.Кудраўцаў, Я.А.Ларчанка, Т.Р.Мархель, У.В.Мацвееў, В.А.Тарасаў, Т.М.Цюрына. **1985**. В.П.Букін, Я.С.Волкава, В.Л.Доўнар, В.Дз.Панамароў, М.Г.Паўлаў, Л.В.Паўлючык, М.І.Сідорчанка, С.У.Смірноў, У.П.Спарышкоў, В.В.Шавялевіч, Р.І.Шаталава. **1986**. А.В.Пяткевіч. **1987**. Т.У.Жыткоўская, У.П.Пяткевіч, С.А.Чупроў. **1988**. С.А.Алексіевіч, У.В.Бокун, І.В.Воўчак, А.М.Голуб, М.І.Комаў, Л.І.Пінчук, Н.А.Сардарава, Ю.І.Хашчавацкі. **1989**. Ю.А.Аксанчанка, А.М.Банад, Л.Л.Баталава, В.А.Ганчарова, Н.М.Гурло, А.П.Данец, У.В.Дашук, В.П.Дзяругін, А.С.Дударэнка, В.А.Дудзін, С.Л.Зубікаў, В.П.Кавалёў, В.В.Кавальчук, А.В.Казазаеў, В.І.Казлоў, А.І.Калашнікаў, В.І.Каляднка, А.У.Кацянёў, А.Г.Корчыкаў, Л.Ц.Мікула, В.В.Моракава, У.Р.Мушперт, А.С.Полагаў, І.В.Поршнеў, А.Ф.Рудзь, У.П.Сухадолаў, А.М.Цімошкін, А.М.Чакмянёў, А.У.Шкадарэвіч, М.М.Шэлехаў. **1990**. А.А.Абадоўскі, Я.Д.Будзінас, А.В.Гур'еў, Л.М.Зайцава, Г.П.Злабенка, Н.У.Лось, С.П.Пераверзева, С.Р.Сычоў, А.М.Тыцюха, В.І.Ханцеева, Л.М.Цыпкіна. **1991**. М.І.Андруковіч, В.І.Анціпава, В.Б.Баброўскі, В.М.Бандарэнка, С.А.Бубенка, С.А.Булыга, Э.М.Гарачы, Л.М.Давідовіч, І.М.Дзям'янава, І.А.Дылеўскі, А.Дз.Зайцаў, С.В.Іваноў, В.С.Іваноўскі, Дз.У.Іосіфаў, В.М.Каралёў, А.Б.Кашпераў, С.А.Кішоў, Н.А.Крывашэева, А.Р.Ледзянёў, І.А.Лянёў, В.А.Мядзведзева, У.А.Мірашнічэнка, У.Я.Міхарскі, І.В.Нарбекава, В.К.Небышынец, С.А.Новікаў, А.К.Памазан, А.Э.Пасіч, А.І.Паўлаў, М.У.Пятроў, М.Ц.Ражкоў, К.І.Рамішэўскі, Л.П.Саянкова, А.М.Смірноў, Ж.П.Чацверыкова, Г.Я.Чацверыкоў, С.М.Шульга, А.Р.Шыцікаў, М.Г.Южык. **1993**. Ю.П.Ківалаў-Станкевіч, Х.Н.Хасанава. **1994**. С.П.Бельцюкоў, С.М.Гасцюхіна, А.Б.Залётнеў, І.В.Кадзюкова, В.М.Капыцько, М.П.Князеў, А.І.Кудраўцаў. **1995**. В.М.Анапрыенка, І.А.Аўдзееў, Б.З.Берзнер, В.Я.Бялько, Л.А.Зубенка, А.А.Калоўская, Г.В.Кананоўіч, А.С.Каткоў, В.М.Кацарэнка, Т.В.Кубліцкая, А.А.Лен-

кін, М.Л.Мартынюк, С.Э.Мураўскі, Н.В.Пальчонак, А.Р.Рыклін, А.А.Сакольчык, А.Б.Сергачоў, Т.У.Федасеенка, Г.І.Холад, В.В.Швяцоў. **1996**. Г.В.Адамовіч, Ю.У.Азаронак, Л.У.Асіненка, В.М.Аслюк, І.Я.Белакапытаў, С.Т.Бондараў, Ю.М.Бяржыцкі, І.А.Волах, А.М.Волкаў, С.А.Галавецкі, Р.В.Грышкова, А.А.Дударау, Р.Я.Зголіч, С.А.Ісакаў, С.Г.Кацьер, В.В.Красноў, А.Я.Кудраўцаў, З.Я.Мажэйка, В.В.Марчанкова, І.С.Пашкевіч, А.В.Пестралобаў, В.Ю.Савіна, В.А.Сцяпанава, У.А.Талкачыкаў, А.М.Трафіменка, А.В.Турава, Д.В.Хайцін, І.В.Чацверыкоў, Я.М.Шыфрын, В.Р.Шышоў. **1997**. А.А.Волкаў, Т.І.Гарчакова, А.Ю.Казакоў, І.М.Калінка, І.В.Лазярко, У.І.Матросаў, С.В.Спяранскі, Дз.М.Сурыновіч, Г.Ю.Тумеля, М.Б.Тумеля, У.Ю.Шчагалькоў, А.Я.Шчэпетаў. **1998**. С.М.Арцімовіч, М.С.Зусмановіч, С.В.Катаржэнка, В.П.Коктыш, П.В.Крывастаненка, А.Р.Проліч, Л.М.Пташук, А.І.Сільвановіч, Ю.П.Чабатароў, М.І.Чаргінец, Н.М.Шукан, С.Ю.Шункевіч. **1999**. Ю.А.Дакучаеў, А.А.Карпілава, Л.І.Пруднікаў, П.Л.Хацько, А.І.Чупрынскі, Г.У.Шур, У.Р.Янкоўскі. **2000**. С.А.Акружная, У.В.Дзёмкін, Н.А.Касцючэнка, Я.І.Краўцоў, А.А.Лапатко, С.А.Матылёнак, Ю.К.Мільтнер, С.М.Мосін, У.А.Мядзведзеў, К.І.Патапаў, С.Г.Саўчык, Л.М.Цімашэнка, Л.В.Чыжэўская, В.В.Чыкіна, Т.І.Яўменава. **2001**. Т.П.Адыгеева, У.А.Байрачны, М.В.Бурачэнка, А.М.Бычкоў, Н.М.Вараб'ёва, Г.В.Вольскі, І.К.Грышан, А.А.Кудзіненка, В.В.Леўчанка, С.А.Машкоўская, Д.Л.Ніжнікоўская, В.Дз.Новікаў, Г.П.Сідарэнка, Н.А.Сосіна, Г.Р.Шкораў, Г.В.Шкуратаў. *А.У.Шкадарэвіч.*

САЮ́З ЛЕСАПРАМЫСЛО́ЎЦАЎ ПАЎНО́ЧНА-ЗАХО́ДНЯГА КРАЮ, рэгіянальнае манапалістычнае аб'яднанне лесапрамыслоўцаў у Рас. імперыі ў пач. 20 ст. Створаны з мэтай процідзеяння спробам Саюза ўсх.-прускіх лесагандляроў і лесапрамыслоўцаў навязаць рас. лесаэкспарцёрам свае ўмовы экспарту лесу ў Германію. Саюз прадстаўляў інтарэсы лесапрамыслоўцаў Арлоўскай, Валынскай, Віленскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай і інш. губ., якія гандлявалі лесам і ляснымі матэрыяламі і транспартавалі іх па Вісле і Нёмане ў Кёнігсберг, Данцыг, Мемель, Бромберг і Торн (Германія). У 1909 аб'ём экспартных паставак саюза быў больш як на 30 млн. руб. Для абароны сваіх інтарэсаў перад герм. лесаімпартнымі арг-цыямі саюз выступаў за ўсталяванне спец. гавані ў Юрбургу, заснаванне ін-та прысяжных мершчыкаў, нарміраванне экспарту для Паўн.-Зах. краю. Саюз вёў перагаворы пра аб'яднанне з інш. рэгіянальнымі арг-цыямі (напр., Саюзам лесапрамыслоўцаў Віцебскай губ.) і стварэнне ўсерас. манапаліст. аб'яднання.

Літ.: Довнар-Запольский М.В. Народное хозяйство Белоруссии, 1861—1914 гг. Мн., 1926. *В.В.Сяховіч.*

САЮ́З ЛІТАРАТУ́РНА-МАСТА́ЦКІХ КРЫТЫКАЎ, Беларускі саюз літаратурна-мастацкіх крытыкаў, добраахвотная грамадская творчая арганізацыя, якая аб'ядноўвае літ. і маст. крытыкаў, літ.- і маст.-знаўцаў, культуролагаў, сацыёлагаў, журналістаў і інш. спецыялістаў у галіне маст. творчасці. Засн. ў 1997 на аснове навукова-творчага прадпрыемства «Авансцэна» (дзейнічала з 1992, да 1996 наз. Цэнтр тэатр. крытыкі «Авансцэна»). Кіруючы орган — з'езд, паміж з'ездамі — Савет, кіраўніцтва ажыццяўляе Прэзідыум Савета. Старшыня саюза — Р.Б.Смольскі. Мэты дзейнасці саюза: развіццё сістэмы літ.-знаўчай і мастацтвазнаўчай адукацыі, павышэнне прафес. ўзроўню крытыкаў, аналіз праблем сучаснай маст. культуры. Члены саюза праводзяць навукова-даследчую, аналітычную працу ў сферы сучаснай культуры і маст. творчасці, канферэнцыі, лабараторыі, семінары па пытаннях тэорыі і практыкі літ. і маст. творчасці, арганізуе фестывалі, выстаўкі, канцэрты, творчыя вечары, прапагандуе лепшыя творы літаратуры і мастацтва Беларусі за межамі краіны. Выдае зб-кі літ.-маст. артыкулаў з актуальнымі праблемамі маст. культуры Беларусі. На 2001 больш за 110 членаў.

Члены Саюза літаратурна-мастацкіх крытыкаў

1997. Э.А.Алейнікава, Г.У.Алісейчык, І.А.Аўдзееў, Р.І.Баравік, Г.І.Барышаў, А.М.Бязуглы, Г.І.Вавула, В.Б.Валодзька, М.М.Воінаў, Т.Я.Гаробчанка, М.І.Гарэцкая, Л.Ф.Голікава, В.А.Грыбайла, М.А.Гугнін, В.І.Жук, Т.І.Кажушка, Н.А.Крывашэева, С.С.Лаўшук, Ж.А.Лашкевіч, Л.А.Лявонава, А.М.Макарэвіч, Дз.Л.Мамачкін, М.А.Манохін, Г.В.Марчук, В.Т.Навуменка, У.І.Няфёд, В.Ф.Нячай, У.І.Пракапцоў, А.А.Ракаў, Г.В.Ратнікаў, У.П.Рошчын, А.В.Сабалеўскі, В.А.Салееў, Р.Б.Смольскі, М.У.Сыты, А.В.Усцінава, Н.Ц.Фральцова, С.Ф.Юркевіч, Н.А.Юўчанка, В.М.Ярмалінская. **1998**. Т.В.Габрусь, Г.Л.Галкоўская, А.Р.Герштэйн, Л.А.Гулякевіч, В.В.Дапкюнас, Л.Ю.Зубарава, В.С.Іваноўскі, Т.М.Команава, А.В.Красінскі, Ю.А.Мансарэнка, У.А.Мішчанчук, А.Г.Папова, Л.Д.Фінкельштэйн, І.Л.Чэбан, М.К.Янкоўскі. **1999**. А.М.Аляксеенка, А.В.Ананьеў, Т.В.Аўдоніна, Н.В.Багноўская, У.П.Балюга, В.І.Бельская, У.А.Бобрык, Е.Л.Бондарава, І.У.Брылевіч, А.І.Бубянцова, Л.А.Волкава, В.М.Галец, Ю.У.Гаўрыловіч, В.В.Гвоздзева, С.І.Даніленка, А.А.Дарафеева, А.М.Дзянішчык, Т.М.Дубяк, В.В.Енджаеўская, А.А.Жук, І.М.Завадская, А.В.Іваноў, С.П.Кажушка, А.П.Кандыба, А.А.Каралёва, С.І.Карамзіна, Я.І.Клімуць, Н.В.Кузьміч, Я.Р.Лазорына, А.В.Лысянкоў, В.В.Лявоненка, П.Я.Магазіннік, А.Р.Майсеенка, В.П.Макарук, М.Ф.Макарцоў, А.А.Манушнікаў, Г.У.Мушперт, А.А.Парукаў, Дз.Дз.Паўлавец, А.Г.Пацюшка, В.П.Пракапцова, М.В.Родчанка, А.А.Савіцкая, А.В.Уласаў, К.С.Усовіч, Т.Е.Фамук, С.Г.Фейгіна, Л.І.Хмара, Дз.А.Хораў, А.П.Цебянькоў, Н.В.Ціханюк, С.В.Чайкова, У.Л.Штукар, Л.З.Шульман, В.К.Шынкарэнка. **2000**. В.П.Жураўлёў, А.А.Карпілава, Б.А.Крэпак, Ю.М.Чурко. *В.А.Грыбайла.*

САЮ́З ЛІТО́ЎСКАЙ МО́ЛАДЗІ, гл. *Братні саюз літоўскай моладзі.*

САЮ́З МАЙСТРО́Ў НАРО́ДНАЙ ТВО́РЧАСЦІ БЕЛАРУ́СІ, Беларускі саюз майстроў народнай творчасці, добраахвотнае грамадскае аб'яднанне майстроў розных відаў нар. творчасці і традыц. рамёстваў, мастацтвазнаўцаў, спецыялістаў у галіне нар. мастацтва і маст. рамёстваў. Створаны ў 1992 на Рэсп. канферэнцыі Т-ва майстроў нар. творчасці Беларусі (засн. ў 1991), з 1995 наз. Бел. саюз майстроў нар. творчасці. Мэта — адраджэнне, захаванне і развіццё традыц. нар. мастацтва, узмацненне ўплыву нар. творчасці на духоўнае развіццё грамадства, спрыянне пераемнасці традыцый, прапаганда творчасці нар. майстроў і творчых калектываў. Вышэйшы кіруючы орган — Рэсп. канферэнцыя, выконаўчы — праўленне. Канферэнцыі адбыліся ў 1995, 1997, 1999, 2001. Старшыня праўлення — Я.М.Сахута (з 1992). Арганізуе выстаўкі, конкурсы, фестывалі і інш. формы прапаганды нар. маст. творчасці. Уваходзіць у Бел. канфедэрацыю творчых саюзаў. На 2001 у саюзе 383 чл.

Члены Беларускага саюза майстроў народнай творчасці

1992. І.У.Алушкін, А.Г.Артынская, К.В.Асташэвіч, Н.П.Багдановіч, А.В.Баталёў, А.В.Бухвалаў, Н.М.Давыдава, З.І.Зіміна, Т.Я.Зіміна, Л.К.Галоенка, Л.Р.Главацкая, Т.Э.Івашына, Дз.Дз.Ільінчык, А.В.Карась, П.В.Карась, М.І.Корабаў, Н.М.Кузняцова, У.Е.Курбан, В.М.Кульпін, У.У.Кушнер, С.В.Кляшчук, В.А.Лабачэўская, А.С.Ламанос, Л.М.Лось, А.М.Маголін, В.У.Мазюк, Т.Г.Мізевіч, С.М.Несцярэўскі, В.А.Паўлава, І.М.Паўлаў, К.М.Пуціліна, Т.Р.Разінская, І.К.Раманчук, В.Я.Салдатава, А.В.Салдатаў, А.В.Салей, С.Р.Саўрыцкі, Я.М.Сахута, У.С.Смірноў, А.В.Трыбіс, І.Ф.Цыглінцава. **1993**. Ю.І.Адамовіч, Л.А.Акавітая, Л.М.Борыс, Л.Ш.Валеева, С.І.Гайдэнкорн, Ю.В.Галавізнін, Ж.У.Гардзеева, А.А.Гасударава, А.А.Глябец, У.В.Гулякевіч, С.І.Жураўская, Т.І.Казлова, С.М.Какшынскі, І.М.Корабава, І.П.Коршун, І.С.Коршун, І.У.Лагуноўская, І.С.Лузько, В.М.Лукашэвіч, З.С.Ляўчэня, А.Г.Маляўская, Ю.А.Мінчанкоў, Л.А.Мялешка, А.В.Новікава, М.І.Няхай, А.В.Пракаповіч, А.Ф.Раманоўскі, Н.М.Сакалова-Кубай, Г.Ф.Сапун, М.К.Сасонка, М.Ф.Сямашка, С.В.Тарайкоўская, Л.А.Уласенка, Л.М.Уласенка, В.К.Уласік, У.В.Цакуноў, В.М.Чырвонцава, Т.В.Эбелашвілі. **1994**. Н.К.Абуховіч, Т.П.Агафоненка, Т.А.Аляксеева, Н.А.Асіповіч, Т.Я.Белая, І.Г.Вавілава, Л.У.Васіхіна, М.В.Васкоўскі, Н.В.Гусева, Н.В.Зямскова, У.А.Касатаў, В.А.Крэсік, Л.Л.Крэсік, В.Л.Курганаў, Л.У.Нікіціна, В.К.Палтаржыцкі, А.Л.Папкоўская, Т.М.Пугачова, Т.А.Рэпіна, Г.А.Суша, В.В.Трубеева, А.А.Уткін, І.П.Фёдарава, А.Ф.Шабуня. **1995**. Н.А.Бандарэнка, А.С.Вярцінская, А.М.Горбаль, А.С.Дубіна, Г.І.Іванова, У.П.Каласкоў, А.Ю.Кірычак, А.А.Макаранка, В.Н.Марозава, К.А.Пакаліцына, М.А.Пратасеня, Р.А.Раманеня, М.М.Салаценка, К.А.Філюта, М.У.Харытончык, Т.А.Чарнета, С.У.Шчэрба. **1996**. Г.М.Безбародка, М.М.Белая, Т.А.Галавачова, Т.У.Ганчарык, В.Б.Герасіменя, Дз.М.Зайцаў, В.А.Зінкевіч, Э.У.Зінкевіч, Т.А.Ільенка, Л.Л.Казачонак, В.М.Казлоўская, В.П.Кучынская, П.Б.Лагуноўская, Ю.С.Лосік, У.К.Лук'янец, З.У.Ляйко, Т.І.Палюховіч, М.Я.Петрасян, Н.Я.Петрушко, С.А.Пратасеня, А.У.Сачак, С.А.Уманец, Л.А.Царыкевіч, М.Н.Чарнавокая, А.І.Чапулёнак, Н.М.Якубовіч. **1997**. М.І.Ажэль, Т.Я.Ажэль, М.А.Анціпкіна, Л.У.Блохава, А.М.Боганева, Н.Ф.Бортнік, Ю.І.Боўда, С.У.Бядзерына, Л.У.Вакар, Н.А.Валынец, С.А.Васіленка, Г.І.Ганчарэвіч, М.П.Гільніч, В.С.Грыц, А.Я.Дабравольская, В.П.Дзенісевіч, В.А.Дзмітрук, Л.Я.Дзярванаў, Я.Л.Дзярванаў, І.І.Драмлюк, В.С.Дранковіч, В.П.Дунеўскі, Н.І.Емяльянчык, Л.М.Зайцава, В.В.Зяноўка, М.У.Кажанеўская, Дз.А.Карлёнаў, Н.К.Кухарава, Т.А.Ларыёнава, А.В.Макаранка, Ю.С.Малышэўскі, М.А.Маркоўскі, В.Ю.Маслава, У.І.Матукевіч, У.К.Мікуцкая, П.А.Міхасёнак, Л.А.Муская, А.А.Мускі, А.У.Мяцельскі, Т.С.Новікава, В.А.Пачкаева, М.С.Пескавая, А.І.Рабкоў, Л.Е.Раманенка, М.Ф.Раманюк, З.Ф.Рынкова, Г.У.Саламянка, Г.Л.Саланінка, І.А.Сікіры-

наў, Б.М.Федаровіч, А.М.Храмкова, К.А.Цітоў, Н.Л.Чырвонцава, Р.Ф.Шаура, А.Ф.Шон, Н.І.Шэйна. **1998**. Т.А.Багдановіч, А.П.Высоцкі, А.В.Жураўлевіч, Л.В.Жураўлевіч, А.С.Іва-

шчанка, В.В.Качаргіна, Н.В.Кошман, А.М.Краўчук, Ю.Э.Круш, І.М.Кулецкая, В.В.Лабачоў, А.В.Лавор, А.М.Лебедзеў, І.І.Лізура, С.А.Лугін, А.В.Мацеша, В.Г.Міхасёнак, М.І.Мядзведзь, С.П.Падальніцкі, В.З.Парашчанка, В.В.Пархімовіч, В.Р.Пісарэнка, А.Л.Пракоф'еў, І.Б.Пярвухін, Т.А.Пярвухіна, В.М.Пятровіч, Н.Ф.Рабунская, М.А.Раманоўскі, А.П.Рослаў, М.М.Рудзяк, М.А.Рышкевіч, У.Б.Сасноўскі, Л.Я.Сватко, М.В.Свірчакоў, С.Р.Сядун, Г.С.Сямёнава, Г.А.Удодава, Т.М.Хадановіч, Т.С.Цімошкіна, С.У.Цітоў, С.С.Чэрнікава, Ю.Ф.Шапавалаў. **1999**. В.А.Александровіч, Дз.А.Арынін, С.В.Бакіноўская, М.І.Бруй, М.Э.Бялова, М.А.Валошчык, А.С.Гаўрылаў, Дз.У.Гром, В.В.Грынашка, Н.В.Гунько, В.І.Данілевіча, Л.А.Дзяржаў-Касінская, В.В.Дубовік, С.А.Дубяга, У.А.Жданюк, І.М.Завадская, В.Г.Іваноў, А.В.Кавалык, Н.Дз.Кананоўіч, В.Б.Каражан, А.І.Каровін, А.К.Карчміт, В.В.Клімчэня, К.У.Краско, А.А.Лазоўская, Г.У.Любімава, В.І.Машнева, А.А.Мацюх, С.І.Мурзін, Р.М.Панфілава, Н.І.Панцялеева, І.І.Папковіч, Я.Л.Пракапенка, А.В.Пракарына, В.М.Раманенка, Ю.Л.Рубашак, І.С.Руткевіч, З.С.Сабко, В.Б.Самойлаў, У.С.Саўрыцкі, Ю.І.Семашкевіч, Д.А.Сіняўская, Т.Ю.Смірнова, А.А.Солтан, А.З.Тамразаў, А.І.Туміловіч, Л.В.Ус, Т.М.Фяськова, Т.М.Хамко, А.А.Хоміч, Л.У.Чадовіч, Г.К.Шамрук, І.Л.Шарак, С.Я.Шор, Л.Э.Юша. **2000**. А.У.Аніська, В.Г.Аскірка, В.С.Валканоўская, А.М.Вараб'ёў, У.П.Гапеенка, П.В.Грынашка, А.В.Гурэеў, М.А.Давыдкін, З.У.Казлова, В.П.Казлова, Н.П.Каспяровіч, У.М.Каханоўская, С.М.Комель, Т.А.Лабунова, І.В.Лысенка, А.Л.Макарава, А.А.Маслік, В.М.Мацвееў, Н.В.Німко, Дз.М.Няхай, І.В.Пазгалёва, Т.В.Пракапчук, П.А.Ражалоўскі, Ж.Я.Розум, Г.В.Свечнікава, М.С.Скляр, А.В.Трампас, А.Э.Шамро, А.А.Шамшэня, А.Г.Шапель, І.М.Штэфан. **2001**. М.А.Абраменка, Ю.А.Андрухін, В.В.Байкова, А.М.Бараўцова, А.А.Белая, Д.А.Бельская, З.Ф.Бярозенская, А.П.Бяжко, А.А.Вашкелевіч, С.В.Вішнеўскі, Л.Г.Гаравая, А.А.Гімадава, Р.Р.Гімадаў, Р.А.Грыкін, Л.І.Грышчанкова, Л.Р.Дрэбезава, А.Я.Дакумаў, Ю.А.Дубнавіцкі, М.В.Ермаловіч, В.І.Залужны, М.І.Калакольцаў, Т.П.Каласкова, Т.Ф.Канавалава, У.П.Карасёў, А.Б.Кірэеў, К.В.Круцялёва, Н.С.Крыварот, Г.М.Кутузава, М.М.Кучыц, А.Ф.Макаранкаў, Дз.А.Міжуй, С.В.Муліца, С.П.Паплаўская, А.А.Паўлаў, С.М.Паўловіч, Я.Р.Песіна, У.М.Пудаў, А.С.Пушкароў, З.В.Раманюк, А.Ю.Радзіёнаў, А.Л.Рудакоўская, Г.Р.Рудніцкая, Г.М.Рымдзёнак, С.Л.Рымдзёнак, В.Л.Рэут, В.П.Савіных, І.Л.Саламаціна, Н.Л.Саламаціна, Г.Я.Салдаценкава, Т.А.Самойленка, А.М.Сапега, В.Р.Сілкоў, В.І.Смірноў, І.П.Супрунчык, Г.А.Унукаў, Н.Л.Федарыстава, Ю.А.Фурс, Г.М.Ханяк, Т.А.Худзякова, Б.Ч.Чарняўскі, С.І.Якушаў, У.Я.Яленскі, Н.І.Ярмух, А.М.Ярош, М.У.Яцкевіч. *Я.М.Сахута.*

САЮЗ МАСТАКО́Ў БЕЛАРУ́СІ, Беларускі саюз мастакоў, добраахвотная грамадская творчая арганізацыя, якая аб'ядноўвае мастакоў і мастацтвазнаўцаў рэспублікі. Мае на мэце садзейнічаць развіццю і прапагандзе бел. выяўл. і дэкар.-прыкладнога мастацтва, мастацтвазнаўства, павышэнню духоўнай культуры грамадства. Засн. ў 1938 на 1-м з'ездзе мастакоў Беларусі (аргкамітэт створаны ў 1933) як С.м.Б. З 1992 наз. Бел. саюз мастакоў. Вышэйшы кіруючы орган — з'езд мастакоў Беларусі, выканаўчы — праўленне. З'езды адбыліся ў 1938, 1948, 1956, 1958, 1960, 1962, 1965, 1968, 1973, 1977, 1982, 1986, 1990, 1992, 1998, 2001. Старшыні праўлення: І.Рубінштэйн (з 1938), А.Грубэ (в.а. з 1941), І.Ахрэмчык (в.а. з 1944), Я.Зайцаў (з 1948), А.Бембель (з 1950), У.Сухаверхаў (з 1954), П.Гаўрыленка (з 1956), П.Масленікаў (в.а. з 1961), В.Цвірка (з 1962), Н.Воранаў (в.а. з 1963), У.Стальмашонак (з 1965), В.Грамыка (з 1968), В.Пратасеня (з 1973), Грамыка (з 1977), Бембель (з 1982), У.Гардзеенка (в.а. з 1984), Стальмашонак (з 1987), Г.Буралкін (з 1990), У.Басалыга (з 2001). У С.м.Б. ўваходзяць Брэсцкая, Віцебскай, Гомельская, Гродзенская і Магілёўская абл. арг-цыі. Саюз праводзіць пленумы, канферэнцыі, семінары, арганізоўвае выстаўкі. Уваходзіць у Бел. канфедэрацыю творчых саюзаў. Пры С.м.Б. Маст. фонд Беларусі. На 12.11.2001 у С.м.Б. 1125 членаў.

Члены Беларускага саюза мастакоў

1940. З.І.Азгур, А.М.Арлоў, І.В.Ахрэмчык, А.А.Бембель, А.М.Бразер, Г.С.Віер, В.В.Волкаў, П.Н.Гаўрыленка, І.Р.Гембіцкі, Д.П.Генін, А.К.Глебаў, А.В.Грубэ, М.І.Гусеў, І.А.Давідовіч, М.В.Дучыц, А.І.Жораў, Я.А.Зайцаў, Г.М.Ізергіна, К.М.Касмачоў, М.А.Керзін, Я.Я.Красоўскі, Л.Ю.Кроль, У.М.Кудрэвіч, Л.М.Лейтман, А.П.Мазалёў, Б.Я.Малкін, М.І.Манасзон, А.П.Марыкс, І.І.Мільчын, З.І.Мірынгоф, Ш.В.Пікус, А.М.Тычына, У.Я.Хрусталёў, Я.М.Ціхановіч, А.М.Шаўчэнка. **1945**. Л.С.Бойка, Г.Ф.Бржазоўскі, А.В.Волкаў, А.С.Каржанеўскі, А.М.Кох, Р.У.Кудрэвіч, М.П.Міхалап, С.Р.Раманаў, І.А.Салавей, М.П.Станюта, У.П.Сухаверхаў, А.А.Ус, В.М.Ціхановіч, А.Дз.Шыбнёў. **1946**. Г.Г.Азгур, М.З.Беляніцкі, А.С.Гугель, В.К.Дзежыц, В.А.Дзядок, Б.Ф.Звінагродскі, С.П.Каткоў, Дз.М.Красільнікаў, А.І.Кроль, С.Дз.Лі, Х.М.Ліўшыц, С.Д.Палеес, З.С.Паўлоўскі, Т.Я.Разіна, Л.С.Ран, М.К.Сеўрук, М.Л.Тарасікаў, М.М.Філіповіч, І.М.Хозераў, В.К.Цвірка. **1947**. М.Дз.Чураба. **1948**. С.І.Селіханаў. **1949**. С.А.Адашкевіч, С.А.Андруховіч, М.А.Блішч, Н.М.Воранаў, Н.І.Галоўчанка, П.А.Данелія, В.І.Ждан, В.К.Жолтак, К.І.Максімцоў, П.В.Масленікаў, Д.М.Парахня, П.М.Раманоўскі, І.Я.Фяцісаў, П.М.Явіч. **1950**. П.М.Герасімовіч, Ф.І.Дарашэвіч. **1951**. П.К.Белавусаў, А.М.Заспіцкі, В.У.Палійчук. **1952**. Е.М.Ганкін, І.В.Пушкоў. **1953**. Я.Дз.Нікалаеў. **1954**. М.Л.Бельскі, А.Б.Грыгар'янц, М.Ц.Гуцieў. **1955**. П.П.Нікіфараў. **1956**. Н.П.Варвановіч, С.П.Герус, М.В.Гурло, П.С.Дурчын, В.Ф.Казачэнка, П.С.Крахалёў, А.Р.Курачкін, А.А.Малішэўскі, У.А.Мінейка, В.М.Савіцкі, У.Ф.Сокалаў, А.С.Шкляр. **1957**. А.С.Барсткоў, І.М.Глебаў, Л.Г.Ліхтаровіч, А.А.Паслядовіч, Я.І.Радзялоўская, Я.М.Харытоненка. **1958**. У.П.Белавусаў, І.С.Дмухайла, А.С.Казлоўскі, У.І.Кухараў, В.Б.Папоў, Я.А.Печкін, М.А.Савіцкі, І.Б.Элентух. **1959**. І.М.Басаў, А.І.Вайнштэйн, М.Х.Даўгяла, К.І.Завіша, У.П.Кульваноўскі, У.А.Лагун, Ю.В.Пучынскі, І.Дз.Рудчык, І.А.Санін, У.І.Стальмашонак. **1960**. М.А.Аўчыннікаў, В.А.Грамыка, М.В.Данцыг, А.М.Кашкурэвіч, М.Я.Лісоўскі, А.В.Луцэвіч, І.І.Пешкур, І.Н.Стасевіч, Г.І.Чарняўскі, В.К.Шыкін, І.М.Елатомцава. **1961**. Г.Х.Вашчанка, В.В.Галубовіч, Ф.Ф.Зільберт, Т.Дз.Ігнацэнка, П.В.Калінін, І.В.Карасёў, В.М.Міхеева, Ф.І.Мохаўцаў, Г.І.Мурамцаў, Г.Г.Паплаўскі, Н.Я.Паслаўская, І.П.Харламаў, А.М.Чуркін, М.П.Чэпік, А.І.Шахновіч. **1962**. А.В.Аладава, А.А.Анікейчык, В.А.Баравік, С.М.Вакар, Б.У.Івонцьеў, Г.А.Ісаевіч, Ф.Л.Лейтман, І.Я.Маслан, У.Н.Папсуеў, І.Ю.Раманоўскі, М.М.Федарэнка. **1963**. А.А.Бялова, М.В.Бяляеў, М.В.Бярковіч, В.І.Васільеў, М.С.Гугель, М.К.Казакевіч, А.Г.Лось, М.Ф.Навіцкі, І.В.Назімава, У.М.Пасюкевіч, В.З.Ражкоў, А.К.Сапетка, В.І.Сахненка, М.А.Шарэнка, В.С.Ягораў. **1964**. А.І.Абрамава, У.І.Ананька, Б.У.Аракчэеў, Ф.М.Бараноўскі, І.І.Белановіч, Р.С.Ганцэвіч, В.Г.Гаўрылаў, В.І.Грос, Л.М.Гумілеўскі, Л.Н.Дробаў, М.Р.Залозны, А.М.Замай, Л.П.Замах, Л.К.Ізмайлава, Б.А.Кірыленка, А.М.Кішчанка, В.Г.Кубараў, Э.С.Куфксо, А.І.Левітан, У.С.Мурахвер, Л.М.Мягкова, М.Я.Навумаў, І.У.Немагай, Я.Р.Новікаў, Б.А.Няпомняшчы, Я.П.Пакаташкін, Л.М.Пакаташкіна, В.С.Пратасеня, І.І.Радунскі, І.П.Рэй, М.З.Савіцкая, У.С.Садзін, А.Ф.Сямілетаў, А.І.Таўкач, І.Ц.Ціханаў, Л.Дз.Шчамялёў, В.Ф.Ярмоленка. **1965**. Дз.І.Алейнік, Ю.П.Альбіцкі, Ф.І.Анісовіч, Г.І.Барышаў, Ю.А.Булычоў, Р.А.Віткоўскі, А.Дз.Дзям'янаў, М.М.Зялёнкін, Я.С.Кулік, Б.М.Кузьмічоў, І.Я.Міско, М.С.Палянкоў, В.І.Ральцэвіч, В.М.Сабалеўскі, К.М.Саломка. **1966**. А.А.Агафоненка, А.І.Анісовіч, Б.Ф.Герлаван, У.А.Дамарад, Л.П.Дубар, А.Р.Захараў, М.С.Кірылаў, М.М.Куйчык, І.В.Мядзведзеў, Г.С.Осіпаў, А.І.Осіпаў, П.П.Пагодзін, І.М.Паньшына, Н.М.Паплаўская, Т.М.Паражняк, М.Ф.Рыбалкіна, М.А.Рыжанкоў, А.А.Салаўёў, А.А.Сурскі, В.М.Ткачук, Л.І.Шакінка, Н.І.Шчасная. **1967**. Л.П.Асецкі, Л.М.Асядоўскі, Л.Я.Багданаў, Л.Ц.Баразна, І.Ю.Бароўскі, В.М.Варламаў, В.І.Вярсоцкі, С.Я.Гарачаў, У.Ц.Гардзеенка, Г.Р.Гаркуноў, І.І.Глазава, У.К.Гоманаў, Ф.Ф.Гумен, Г.І.Дзянісаў, Р.Г.Дубар, Л.А.Дударэнка, Я.К.Іванешка, А.І.Казак, В.А.Леантовіч, Б.П.Льдокаў, П.К.Любамудраў, У.М.Лятун, Л.А.Майзельс, Б.І.Маркаў, М.А.Моўчан, З.С.Мяньшова, М.А.Назарчук, М.П.Назарэнка, М.М.Палякоў, А.С.Папоў, К.М.Пятроў, С.Я.Раўдвеэ, У.А.Рыкалін, Я.У.Санько, І.М.Сталяроў, В.Ф.Сумараў, А.А.Ткачонак, Б.Н.Ус, І.К.Утарушын, В.М.Філімонаў, В.Е.Ціханенка, К.Г.Ціханоўіч, Я.Р.Чамадураў, М.М.Шаўцова, Г.Ф.Шутаў, Л.М.Эрлер. **1968**. М.А.Апіёк, М.С.Макаранка. **1969**. Ф.І.Валадзько, А.П.Веліксонаў, А.М.Дзямарын, Ю.К.Зайцаў, Г.Т.Злотнік, Б.Ф.Кавецкі, М.А.Карпук, Я.К.Красоўскі, І.У.Краўчанка, В.А.Крылоў, І.Г.Крэйдзік, Л.М.Лось, М.Дз.Міхайлаў, У.М.Мудрогін, Л.Ф.Панамарэнка, У.С.Пашчасцеў, Э.А.Петэрсон, М.М.Пушкар, У.А.Самачарноў, К.І.Харашэвіч, П.А.Цомпель, В.П.Шаранговіч, У.Н.Шпартаў. **1970**. С.Ц.Абрамаў, А.Я.Арцімовіч, У.А.Бойка, К.А.Вакс, М.М.Волахаў, Л.Э.Гадлеўскі, В.Г.Дзвінская, П.М.Драчоў, Ф.М.Жураўкоў, А.Ц.Зайцаў, С.Р.Кавалёў, Б.І.Казакоў, В.А.Казлоў, М.І.Кандрацьеў, Я.А.Карманаў, С.С.Каткова, М.У.Кірэеў, Б.А.Крэпак, У.Л.Кузняцоў, З.В.Літвінава, П.П.Лысенка, У.К.Міхайлоўскі, С.І.Нартава, Л.Я.Прагін, С.Дз.Салохін, В.М.Свентахоўская, П.У.Свентахоўскі, У.П.Слінчанка, Ю.В.Тышкевіч, Г.Я.Ціхановіч, Л.В.Чурко, В.С.Швяцоў, Л.А.Шпак, Я.А.Шыбнёў, М.А.Шырокаў, Г.К.Шэлег. **1971**. Э.К.Агуновіч, М.С.Басалыга, У.С.Басалыга, А.К.Белавусаў, У.А.Булыга, М.І.Ганчароў, І.У.Грыгаровіч, Л.Р.Давідзенка, У.А.Дзяменьцеў, Л.Б.Зільбер, Г.П.Івакін, А.А.Краўчук, М.Р.Лазавой, М.А.Плужнік, В.Ф.Шматаў, М.М.Якунін. **1972**. А.Р.Арлоў, А.П.Бельцюкова, В.А.Говар, Г.С.Грубіна, У.П.Зубараў, А.У.Ілыноў, М.І.Крукоўскі, Ю.М.Любімаў, В.С.Мігаль, А.В.Някрасаў, Дз.А.Папоў, В.А.Позняк, А.М.Пучейка, А.І.Рыбчынскі, М.М.Рыжыкаў, Г.С.Скрыпнічэнка, А.Л.Чысцякоў, Я.С.Ясьвін, В.К.Яўсееў. **1973**. М.П.Балюк, А.В.Бараноўскі, С.А.Волкаў, А.І.Зіменка, Я.А.Ігнацьеў, Л.П.Каленік, Г.К.Качаноўскі, Ю.І.Кухараў, В.М.Лук'янаў, М.А.Меранкоў, В.А.Напрэнка-Ляховіч, У.Ф.Пракоф'еў, І.М.Пратасеня, У.Р.Раманаў, В.А.Тарасаў, А.М.Тарасян, В.П.Цюрын, В.С.Чайка. **1974**. І.М.Андрыянаў, Г.Ц.Гарбанёў, Н.М.Голышава, Я.І.Жылін, Я.Г.Каробушкін, М.І.Ліханен-

ка, Л.М.Марчанка, Ю.І.Нікіфараў, Б.І.Пярвунінскіх, У.В.Уродніч, С.М.Цуканаў. **1975**. І.Б.Булгакава, У.І.Вітка, Л.П.Воранава, М.Ф.Глушко, А.М.Даўгяла, Л.І.Зяневіч, У.Я.Крукоўскі, Л.Г.Лапцэвіч, Т.Ц.Мацвеенка, У.Л.Новак, Ю.В.Няжура, Ю.Г.Палякоў, У.С.Піменаў, Э.П.Позняк, С.М.Сакалоў, А.У.Хадыка, І.А.Шастапалаў, А.С.Шатэрнік, М.М.Яніцкая.

1977. П.С.Арцёмаў, А.А.Бачкароў, Э.А.Белагураў, Г.А.Гаравая, Г.С.Грак, Э.М.Грамыка, Я.І.Ждан, А.П.Крахалёў, А.А.Марачкін, В.П.Маркавец, М.М.Селяшчук, М.А.Стома, А.Ф.Федаркоў, У.В.Церабун, У.Ф.Чарнышоў, Г.С.Шумскі, В.Дз.Шчарбакоў, А.А.Ясюкайць. **1978**. Э.Б.Астаф'еў, Ю.Б.Багушэвіч, Я.С.Бусел, А.І.Гаршкавоз, Ю.В.Гаўрын, В.У.Грыдзіна, В.П.Занковіч, Г.П.Кісялёў, М.Р.Клімаў, М.М.Купава, Т.І.Малышава, У.А.Нікалаеў, В.В.Нямцоў, А.І.Салятыцкі, А.М.Сурмач, У.В.Ткачоў. **1979**. У.М.Вольнаў, Г.Л.Жарын, П.С.Захараў, В.А.Захарынскі, В.І.Кліменка, А.А.Кокцеў, Р.Я.Ландарскі, Л.Ф.Леўчанка, А.В.Масіенка, А.Р.Пятрухна, Т.М.Сакалова, У.А.Самсонаў, Я.М.Сахута, Л.І.Скрыпнічэнка, Б.Б.Цітовіч, А.І.Чартовіч, Ф.В.Шастак, К.Ф.Шастоўскі, Ю.В.Якубовіч. **1980**. М.І.Байрачны, Т.П.Белавусава-Пятроўская, Г.В.Буралкін, М.У.Бушчык, М.І.Валынец, В.Ф.Дзенісенка, С.Дз.Дзьяканаў, У.І.Жук, А.М.Зінчук, У.М.Капшай, Т.І.Кіршчына, А.С.Клімянкоў, А.А.Концуб, А.А.Лапіцкая, С.М.Ларчанка, У.Л.Лашкевіч, Н.В.Лівенцава, У.М.Маскоўскіх, А.І.Мятліцкі, С.Ф.Палякоў, У.Т.Паражняк, А.М.Пашкевіч, В.Р.Прыешкін, А.І.Родзін, Л.М.Сцяпанава, Я.М.Сяменаў, А.М.Цяткоў, В.І.Юркова. **1981**. К.І.Аляксееў, В.Ф.Байцун, В.І.Валынец, У.У.Васюк, Ю.П.Герасіменка, У.Л.Зінкевіч, М.І.Ісаёнак, М.Р.Казлоў, В.А.Калтыгін, І.І.Курачыцкі, В.В.Мікіта, Л.П.Сівакова, В.П.Славук, У.Я.Сулкоўскі, У.А.Ткачэнка, С.М.Федарэнка, В.К.Чуглазаў, У.С.Шнарэвіч, А.К.Шэвераў. **1983**. Л.Р.Аганаў, І.А.Волкава, С.Р.Гарбунова, А.Я.Дзятлава, А.В.Кузьміч, А.В.Кузняцоў, К.Г.Паплаўская, Г.А.Пусеў, П.А.Семчанка, У.І.Слабодчыкаў, В.М.Смаляк, Н.У.Сухаверхава, В.П.Ціханаў, А.І.Цыркуноў. **1984**. В.У.Альшэўскі, А.А.Аніщчык, В.К.Барабанцаў, В.М.Буціна, В.Ц.Даўгала, С.І.Катовіч, С.І.Кірушчанка, У.М.Коўзусь, В.С.Крывашэева, І.М.Лобан, А.М.Маціевіч, В.М.Назараў, Л.І.Пятруль, В.Ю.Сазыкіна, Л.Ф.Салавей, А.М.Фінскі, М.Я.Цурыкаў, В.П.Чайка, У.У.Чурыла, П.П.Шарыпа, Ф.І.Янушкевіч, А.І.Яскін. **1985**. С.А.Бандарэнка, М.С.Будавей, І.А.Галавацкая, С.У.Дамарад, Ю.М.Івахнішын, М.І.Ісаёнак, В.М.Карнееў, У.У.Кожух, З.У.Ландзік, Г.В.Літвіненка, М.І.Міронаў, М.Л.Нестярэўскі, А.І.Салохіна, С.У.Саркісаў, П.М.Фей, А.М.Шныпаркоў, Г.А.Юзеева. **1986**. Т.П.Агафоненка, В.Ф.Александровіч, Т.А.Арцёмава, Дз.В.Бабкін, М.Т.Бандарчук, Т.І.Васюк, А.М.Гвоздзікаў, Л.Р.Главацкая, У.П.Голуб, Р.М.Данчанка, У.Э.Дубавецкі, А.Ф.Кавалёў, І.Дз.Кліменка, Г.П.Крамко, Г.П.Крываблоцкая, У.В.Крываблоцкі, М.І.Лук'янаў, А.І.Мацвяйчук, Ю.А.Піскун, У.І.Пракапцоў, С.М.Рабашчук, В.Б.Сідоркін, Р.С.Сітніца, А.М.Слепаў, Н.У.Сустава, М.Я.Таболіч, Р.Ф.Таболіч, Г.Я.Туроўская, В.М.Фей, Т.Л.Хацановіч-Дарбінян, В.А.Шылко. **1987**. Л.Э.Бартлаў, А.І.Бранцаў, С.В.Войчанка, Н.Ф.Высоцкая, Ю.У.Гудзіновіч, Ю.П.Зуеў, В.С.Каваленка, В.В.Кавальчук, Л.М.Кавальчук, У.Дз.Кандрацьеў, С.І.Казак, П.А.Карнач, К.І.Качан, А.П.Ксяндзоў, М.П.Кузьміч, У.Э.Куфко, В.С.Лявунін, М.А.Маеўскі, А.У.Отчык, І.І.Рамашоў, В.П.Свістуноў, Р.П.Сіплевіч, Б.А.Скрамблевіч, Л.В.Хобатаў, У.Я.Цэслер, А.І.Шалюта, М.К.Ягорава. **1988**. М.К.Абрамаў, Л.С.Анціманаў, І.В.Арлоў, Г.А.Асташонак, М.В.Аўчыннікаў, С.У.Балянок, А.А.Баразенніка, В.В.Баранаў, Ю.А.Баранаў, І.А.Бархаткоў, З.У.Баўтрук (Раўко), А.У.Бацвінёнак, Т.П.Беразенская, Н.Г.Бранавец, В.Я.Буйвал, В.М.Бяляўскі, П.П.Васілеўскі, У.М.Вішнеўскі, В.В.Вярсоцкі, Т.Г.Гаранская, Л.М.Гатальская, М.А.Гатальскі, М.М.Гаўрыленка, В.І.Грыгарышына, С.А.Грыневіч, Л.В.Грыцкоў, М.І.Гуршчанкоў, А.А.Дабравольскі, В.М.Даманава, А.У.Даманаў, Л.П.Данелія, Ю.А.Дзееў, В.В.Дзёмкіна, В.К.Дубрава, М.К.Дубрава, У.А.Еўтухоў, М.П.Жабінская, В.І.Жук, У.М.Жук, У.У.Іваноў, В.З.Кавалеўскі, І.У.Казак, А.М.Каласенцава, В.В.Камароў, Ю.А.Карачун, В.К.Касцючэнка, У.У.Качан, І.І.Кузняцова, С.У.Кузьмічоў, К.М.Куксо, Т.М.Курачыцкая, Н.У.Кухарэнка, М.Я.Латушка, С.В.Ліфанаў, С.А.Логвін, У.А.Лукашык, А.П.Лучыновіч, Ю.Г.Макараў, У.А.Малахаў, І.В.Малеціна, Н.В.Маліноўская, А.А.Мацюшэўская, У.І.Мелехаў, Л.Ю.Міньковіч, А.І.Непачаловіч, Ю.М.Несцярук, А.Р.Ойстрах, А.А.Панцюк-Жукоўскі, У.У.Папсуеў, Л.Л.Пуцейка, С.М.Пчалінцаў, Т.А.Пятроўская, К.С.Ракіцкі, У.П.Рамейка, В.В.Распопаў, Н.А.Рачкоўская, Л.М.Рацько, Л.А.Рыжкоўскі, Э.Ґ.Рымаровіч, Г.Г.Сакалоў-Кубай, Л.У.Салодкіна, С.С.Свістуновіч, Г.М.Сіверцава, А.А.Скавародка, А.П.Ступень, У.І.Сытчанка, В.А.Трыгубовіч, І.І.Уладычык, А.М.Фралянкоў, У.П.Хадаровіч, Ф.І.Хамініч, К.У.Хацяноўскі, Я.І.Хайрулін, В.В.Хмялеўскі, В.В.Ціханавец, М.М.Цудзік, Ю.С.Чарняк, Р.П.Часнова, Г.Л.Чысцякова, К.П.Шаранговіч, А.К.Шастоўская, Л.Л.Шчамялёва, А.С.Шыёнак, В.С.Юзвук, В.М.Юркоў, В.І.Янушкевіч. **1989**. А.Б.Александровіч, А.В.Александровіч, Л.Б.Алімаў, К.Г.Асадаў, С.В.Асоскаў, М.І.Астапенка, А.К.Баглай, М.А.Бакуменка, М.І.Басаў, Л.Б.Бортнік, М.В.Бязберды, Н.А.Валынец, Р.У.Галаватая, У.В.Ганжа, Л.У.Гоманаў, Л.І.Грыцэнка, А.Я.Грэсь, І.М.Данілава, А.М.Дваронін, Л.І.Захадзячэнка, Я.П.Зельская, Г.А.Зельскі, Р.М.Іваноў, У.К.Казакоў, У.П.Кароткі, Р.І.Кійко, І.А.Кісялеўскі, С.Б.Кічко, Р.П.Клімковіч, М.Н.Кляцкоў, Г.А.Кобрын, А.Дз.Кудраўцава, А.П.Кузняцоў, Г.П.Лебедзеў, Я.І.Ліс, У.М.Лосеў, А.У.Лось, П.Дз.Лук'яненка, У.Б.Максімаў, Р.Л.Малышаў, У.П.Масленікаў, А.К.Мароз, Дз.Р.Маслій, В.А.Мядзвецкі, І.І.Надашкевіч, Л.І.Пакульніцкі, В.А.Палікарпава, А.С.Петрыканец, Я.Б.Пуставой, М.Ю.Пюке, М.С.Ржавуцкі, Б.Ф.Рэпін, Н.Я.Сакалова, Г.У.Саламянка, Я.П.Саламянка, Р.С.Салаўёва, Л.М.Салаўёў, Г.М.Сідарэвіч, В.Дз.Ціханава, Я.І.Ціханаў, К.Я.Цюрына, С.В.Цярэнцьева, В.І.Чарняк, Н.А.Чорнагалова, А.П.Чудзін, У.А.Шапялевіч, В.Ф.Шкаруба, М.Л.Шкробат, Я.Ф.Шунейка, А.І.Шчаслівая, М.П.Шышлоў, А.К.Юрашкевіч, С.М.Янкоўскі, П.В.Янушкевіч, Н.А.Яўглеўская. **1990**. В.А.Андросаў, М.М.Андруковіч, Т.В.Арасланава, А.П.Багустаў, М.Ф.Барздыка, І.І.Бокій, М.В.Бякеева, К.Г.Вашчанка, А.Б.Высоцкі, Л.Б.Гандыш, У.І.Ганчарук, І.П.Ганяеў, Т.В.Гардашнікава, Г.В.Говар, В.А.Губараў, С.Л.Гумілеўскі, А.Ф.Гуршчанкова, А.І.Дасужаў, В.П.Дземянчук, Ф.М.Драгун, М.А.Драненка, А.В.Дранец, В.Г.Дубовік, А.Г.Задорын, Р.Л.Заслонаў, В.У.Іванькова, У.П.Ісачанка, А.Ю.Кажаноўскі, М.П.Канцавой, В.І.Каралёў, І.А.Кашкурэвіч, Ф.А.Кашкурэвіч, А.А.Квяткоўскі, Л.Г.Кір'янаў, С.Я.Клімчук, Я.А.Колчаў, С.А.Кузьмар, С.С.Курашова, А.І.Ладзісаў, І.І.Лісіца, А.У.Лось, П.І.Лук, В.У.Лямачка, С.А.Малішэўскі, А.В.Масейкаў, У.У.Мехавіч, Г.М.Міхайлава, В.Ф.Міхайлоўскі, В.А.Міхайлюк, Г.М.Міхейчык, В.П.Мурашка, Я.С.Мусінская, А.М.Назаранка, П.М.Назаранка, У.П.Напрэенка, А.П.Новік, П.А.Новікаў, М.П.Няхайчык, М.Ф.Образаў, Я.Г.Панамарэнка, А.Р.Папоў, У.М.Рубцоў, Т.А.Рудэнка, Ю.В.Рудэнка, Л.Г.Русава, В.К.Рускевіч, Л.І.Сакалоў, С.К.Сенчанка, А.І.Сеслікава, В.Я.Сівер-цаў, А.М.Смаляк, С.У.Стальмашонак, А.І.Судар, Дз.А.Сурскі, А.Я.Сямёнава, У.П.Табушаў, М.І.Таранда, Э.С.Трыкоза, С.А.Цімохаў, Т.М.Чуглазава, У.Дз.Шапо, М.Ф.Шкляраў, В.М.Ярэська. **1991**. М.І.Агафонаў, А.А.Алонцаў, У.І.Асіповіч, А.А.Бараноўская, П.П.Бондар, К.Г.Гаджыеў, Г.Дз.Герасімава, В.А.Герасімаў, М.С.Гіргель, Л.М.Гоманаў, М.А.Гугнін, С.Ф.Давідовіч, У.У.Дзядзюля, Л.А.Доўбаш, М.М.Дундзін, В.П.Дураў, Л.М.Зуева, В.А.Ільіна-Загнетава, В.Я.Кавальчук, В.М.Калацэй, В.І.Камлюк, У.М.Каралькоў, А.Ф.Карпан, Г.М.Конанава, А.У.Крошкін, А.В.Крылоў, А.У.Куко̆ўскі, В.Р.Ландарскі, А.П.Лапшын, В.Р.Лук'яненка, Т.І.Отчык, У.І.Панцялееў, Т.І.Паўлючук, А.В.Пашкевіч, А.Р.Пашкевіч, Л.В.Прошчанка, А.М.Пушкін, В.І.Ражко, І.В.Рымашэўскі, У.І.Рынкевіч, І.Г.Савін, А.А.Сальнікаў, В.С.Стасевіч, Г.Х.Стасевіч, А.С.Суша, У.Б.Сушкевіч, І.В.Сямека, Г.Л.Танковіч, П.Б.Урублеўскі, А.І.Фяцісава, Г.С.Хінко-Янушкевіч, С.Г.Харашаўцаў, У.Ц.Хмызнікаў, І.В.Хоміч, В.В.Чукін, В.У.Шоба, Л.С.Шчасная, У.І.Шчэрбін. **1993**. С.Л.Абрамовіч, В.М.Ажгірэй, В.В.Аржанухіна, Г.М.Бараноўская, М.І.Барбарчык, А.С.Бычкоўскі, А.В.Васілевіч, Г.С.Васільева, В.В.Васільеў, А.Л.Верашчагін, В.Р.Віткоўская, У.І.Гавазюк, У.В.Гладкевіч, М.Г.Голубева, П.Л.Гонта, А.У.Грыбава, У.У.Дамнянкоў, У.К.Даўшэвіч, У.А.Дзіўніч, А.Я.Дзянісьеў, У.І.Жбанаў, Л.В.Жураовіч, Ю.І.Казакоў, Ю.М.Каралевіч, А.М.Каструкоў, А.В.Кошалеў, А.У.Кулін, Г.С.Лойка, Л.М.Лук'янцаў, В.К.Лябедка, Э.Г.Малішэўская, Г.В.Матусевіч, А.І.Мірончык, В.Е.Несцярэнка, Ю.М.Падолін, М.Р.Панічэўскі, Ю.А.Платонаў, А.М.Пятроў, В.У.Рабчонак, М.С.Ракіцкене, М.Дз.Рыжы, В.С.Сідарава, А.Дз.Слуцкі, В.П.Сташчанюк, В.С.Сямашка, Э.Р.Сямёнава, Б.А.Сямілетаў, Г.П.Сянькоўскі, І.В.Тапілін, М.І.Ткачоў, Ю.І.Хілько, В.В.Шамшур, Р.В.Шараеў, Р.Ф.Шаура, С.К.Швайбовіч, У.Ф.Швайбовіч, І.М.Шкуратаў, В.І.Шчасны. **1994**. А.Я.Агафонава-Шох, А.Б.Аракчэева, А.І.Атраховіч, Г.Я.Балаш, А.Р.Барташэвіч, Т.У.Батакова-Мацвеенка, М.Г.Бацюкова, В.М.Блінцова, А.І.Бяляўскі, Н.С.Варламава, Г.А.Выгонная, Дз.М.Вымаркава, І.І.Генаў, М.В.Грук, Л.М.Гурбо, Л.М.Густава, С.У.Даманава, В.Я.Данчук, А.А.Дзяшко, Н.М.Залозная, П.В.Зарэцкі, Б.У.Караванаў, М.І.Кебец, Р.І.Кірдзей, М.Б.Князева, М.К.Канькоў, М.П.Кулеш, С.А.Лагуновіч-Чарэпка, А.П.Лубнеўскі, Б.М.Малахаў, Т.Дз.Пясецкая, А.В.Раеўскі, Л.В.Раманоўскі, А.П.Сакалоў, В.А.Санкова, Дз.У.Сарока, М.У.Сенькін, Ю.П.Сергіенка, І.В.Сміцяенка, Г.Ф.Сурма, Г.У.Сухамлінаў, І.У.Уласаў, А.Я.Фядусь, А.М.Хвісевіч, В.І.Хмыз, І.М.Цішын, Г.Р.Чысты, А.Б.Шаліма, У.У.Шаркоў, С.С.Шафранавіч, М.В.Шматава, А.К.Шостак, Ю.У.Якавенка. **1995**. І.В.Андрасюк, В.В.Антановіч, У.Я.Ануфрыеў, Н.М.Апёк, В.І.Баранаў, А.Я.Белы, Э.У.Бубашкіна, Я.Я.Бусел, Р.П.Вашкевіч, В.М.Велігжанін, А.Дз.Вярбіцкі, І.В.Грыгарышына, С.Ф.Давідовіч, В.Л.Доўнар, А.І.Дулуб, В.К.Жыхараў, М.Р.Залатуха, І.С.Засімовіч, Дз.А.Зянькоўскі, А.С.Ізаітка, М.М.Інькоў, К.К.Калодзіч, А.В.Канавалаў, Т.І.Карэлкіна, Р.Ф.Клікушын, М.Л.Кругліка ва, А.Р.Купрыянаў, Ф.С.Ладуцька, У.А.Ламейка, Н.С.Лісоўская, І.В.Лыскавец, А.А.Люцко, М.В.Ляўковіч, А.А.Ляшчынскі, В.У.Магучы, Ю.І.Маліноўскі, А.У.Малярэвіч, А.А.Міхайлаў, І.С.Мойгіс, М.У.Несцярук, У.У.Няфёд, У.А.Осіпаў, В.П.Пакаташкін, І.Дз.Папоў, С.П.Прывада, Ю.Ф.Пятроў, У.В.Ракіцкі, С.Л.Рыжыкава, Ф.А.Сарока, У.П.Свентахоўскі, К.У.Селіханаў, Г.А.Скабіцкі, А.А.Стралкоў, А.Б.Суворау, Л.Ю.Сцефановіч, Л.І.Талбузін, Т.І.Хвайніцкая, Б.Я.Хесін, Л.С.Хоміч, В.М.Целеш, У.А.Ціханаў, І.М.Чумакоў, Г.В.Шапялевіч, А.С.Шомаў, М.А.Шулякоўскі, Н.І.Шчасная, А.В.Юр'ева, Л.П.Яшэнка. **1996**. Я.П.Адзіночанка, І.В.Алісевіч, С.Т.Асапрылка, А.Я.Бур'як, А.М.Варвашэня, А.А.Велікжанін, А.М.Волкаў, І.У.Голубеў, П.Б.Грывусевіч, А.М.Грышкевіч, Н.М.Гурло, А.В.Даманаў, І.І.Данільчанка, А.М.Дзямідаў, Л.А.Елісееў, І.Л.Жук, Б.Г.Іваноў, С.В.Іванцоў, У.А.Канцадайлаў, А.А.Карповіч, А.І.Карповіч, В.А.Каўшырка, П.А.Кірылін, Г.А.Кірыловіч, В.Ф.Крук, Дз.А.Кузняцоў, І.В.Леантовіч,

З.А.Луцэвіч, А.І.Лышчык, В.М.Мартынчук, В.С.Маршак, А.І.Марышаў, П.І.Мураўчук, С.Г.Наздрын-Платніцкая, А.П.Новікаў, М.М.Паграноўскі, А.М.Падалінскі, П.В.Прохараў, Л.І.Радзевіч, І.К.Радкевіч, Р.М.Раманка, Дз.М.Раманюк, П.Дз.Русак, С.В.Рымашэўскі, А.М.Сільвановіч, Б.М.Смольскі, І.Г.Стальная, С.П.Статкоўская, Ю.Л.Сухаў, Г.А.Фалей, Г.А.Фатыхава, А.А.Чміль, А.І.Чыгрын, Ж.К.Чыстая, А.М.Шабалтас, А.Г.Шлегель-Лавецкая, Ж.А.Шыплоўская, Т.В.Юркевіч, А.У.Яснова. **1997**. Ю.М.Алісевіч, Ю.Г.Анушка, Х.Г.Асадулаеў, В.Р.Асіпенка, П.С.Багданаў, А.У.Басалыга, Т.Дз.Беразоўская, У.А.Бірыцкі, В.К.Бондараў, В.А.Борздны, К.Л.Бяляева, Р.Л.Газаранц, І.Л.Гардзіёнак, В.М.Гардзіёнак-Кірэева, Н.М.Гарчанюк, У.Я.Голубеў, В.В.Даноўскі, А.Л.Дударэнка, А.І.Жалудко, А.П.Жураўлёў, Ю.І.Івашкевіч, І.Л.Каваленка, Н.У.Кавалёва, А.Д.Кастагрыз, А.К.Касцючэнка, М.У.Кухарэнка, Т.Ю.Лактаева, Г.А.Лаўрэцкі, У.І.Лісавенка, І.В.Магучая, І.А.Марачкін, Н.П.Марчанка, А.П.Махніст, Ю.В.Мацко, Л.І.Мельнікаў, А.В.Мірскі, В.В.Мурашова, Л.Л.Мядзведскі, І.М.Мятліцкая, П.К.Паршын, Ю.В.Пашкуць, А.С.Плячкоў, Т.С.Радзівілка, Н.М.Сакалова-Кубай, У.У.Сарока, А.В.Свірыдзенка, Т.А.Сіплевіч, А.Г.Сіцько, В.А.Татарнікава-Панок, П.Ю.Татарнікаў, Ю.І.Татарнікаў, Л.В.Трацэўскі, У.Дз.Тулупаў, А.У.Фалей, А.І.Фядотаў, А.І.Шароін, І.У.Шкіра, В.Р.Шрамкоў, І.В.Ягораў, А.В.Ярмоленка. **1998**. Я.Н.Ражкоў, В.І.Ясюк. **1999**. М.А.Арасланаў, П.І.Асмакоўскі, А.А.Асташоў, Н.М.Богдан, І.М.Бяспалаў, Т.В.Габрусь, А.А.Грыгор'еў, Ф.С.Грыг'ян, В.Г.Грыцаева, С.П.Гусельцаў, Г.П.Драздоў, А.Э.Духоўнікаў, М.У.Загранічны, Н.В.Зелянко, У.У.Кандрусевіч, Т.С.Карака, Л.М.Кірылава, І.М.Козел, А.П.Колас, М.М.Колас, В.К.Копач, М.М.Крукаў, В.Г.Крупянкова, У.Э.Лавецкі, В.В.Лагоўскі, Б.Ч.Лазарэвіч, Я.А.Ларчанка, Т.П.Лісіца, Л.А.Макатун, І.Б.Маланаў, Н.Л.Марчанка, Р.В.Мяжуеў, В.М.Нікалаеў, В.М.Нуднаў, А.Л.Нядзелька, А.Я.Няхайчык, Ж.Я.Няхайчык, Г.С.Панамароў, У.М.Панамароў, А.Ц.Пушкар, Ю.Л.Рыжыкаў, А.В.Сандрыгайла, В.В.Саўчанка, В.Я.Семянько, Л.А.Сідзельнікава, В.А.Смоляр, Дз.М.Сурыновіч, Г.І.Сямікашава, А.Р.Сяргеева, Л.М.Тарабука, А.В.Томка, А.А.Фалей, К.У.Харанека, В.К.Шімафееў, М.Л.Цыбульскі, Т.А.Чарнышова, А.У.Шапо, А.П.Шарыпа, С.Л.Шэмет, А.Я.Шыбнёў, Р.І.Яновіч. **2000**. А.М.Алебастраў, К.М.Андруковіч, М.М.Асауляк, У.А.Афанасьеў, С.І.Бышнёў, Л.Ф.Валасюк, Ю.В.Валынец, А.М.Гайдуковіч, Г.В.Горава, У.М.Грыцкевіч, С.М.Дзенісенка, Т.У.Дзянісава, В.В.Ерамееў, М.С.Забіран, В.Ф.Калясінскі, П.У.Кандрусевіч, Ж.А.Капуснікава, Т.В.Капыльская, С.У.Кастрыца, А.А.Касцючэнка, У.Э.Кірэенка, Я.Л.Кір'янаў, У.А.Клімушка, І.Р.Кныш, Ю.М.Козел, Ю.Г.Крупянкоў, А.С.Кухараў, В.М.Лазоўскі, А.Я.Мацвеенка, Дз.М.Мохаў, І.І.Мядзведзеў, В.В.Нікішына, У.М.Пахаўцоў, А.М.Пікулік, В.П.Раманоўская, А.У.Савіч, Н.А.Сардарава, М.П.Свістуноў, У.П.Тамашэвіч, В.В.Угрыновіч, А.А.Хараберуш, В.П.Храмцэвіч, В.І.Цэхановіч, С.В.Чарановіч, Н.В.Шаранговіч, І.Г.Шчасная.

С.У.Пешын.

«САЮЗ МІХАІЛА АРХАНГЕЛА», «Рускі народны саюз імя Міхаіла Архангела», чарнасоценная (гл. *Чарнасоценцы*) арг-цыя ў Расіі ў 1908—17. Узнік у пач. 1908 у выніку выхаду з *«Саюза рускага народа»* шэрагу ультраправых дзеячаў на чале з У.М.*Пурышкевічам* (старшыня саюза да лют. 1917). Названы ў гонар нябеснага апекуна цара *Міхаіла Фёдаравіча*, заснавальніка дынастыі Раманавых. Кіруючы орган — Гал. палата з 14 членаў (у Пецярбургу). Аддзелы ў Маскве, Кіеве, Адэсе, Мінску, Гомелі, Магілёве, Бабруйску і інш. Праграма ў значнай ступені супадала з праграмай «Саюза рус. народа», але прызнавала неабходнасць Дзярж. думы пры поўным пазбаўленні выбарчых правоў яўрэяў, падтрымлівала агр. палітыку П.А.*Сталыпіна*. Дзеячы «С.М.А.» выступалі ў друку (газ. «Колокол», штотыднёвікі «Прямой путь», «Зверобой»), распаўсюджвалі свае кнігі і брашуры, праводзілі сходы, гутаркі, масавыя акцыі, арганізоўвалі антысеміцкія кампаніі. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 дзейнасць «С.М.А.» спынена.

А.І.Валаханоўіч.

САЮ́З МО́ЛАДЗІ БЕЛАРУ́СІ (СМБ), Беларускі саюз моладзі (БСМ), добраахвотная маладзёжная арганізацыя. Створаны ў снеж. 1991 на XXX з'ездзе ЛКСМБ у выніку перайменавання ў СМБ. Асн. задачы: вырашэнне сац. праблем, абарона жыццёвых інтарэсаў маладых людзей. У лют. 1995 на XXXII з'ездзе СМБ перайменаваны ў БСМ, а ў маі 1999 на XXXIV з'ездзе — у грамадскае аб'яднанне «Бел. саюз моладзі». Аб'ядноўвае юнакоў і дзяўчат ва ўзросце 14—30 гадоў. На 1.1.2001 дзейнічалі ЦК, 6 абкомаў, 54 райкомы і гаркомы, якія аб'ядноўвалі 22 102 членаў СМБ.

САЮ́З МУЗЫ́ЧНЫХ ДЗЕ́ЯЧАЎ БЕЛАРУ́СІ, Беларускі саюз музычных дзеячаў, добраахвотная творчая арганізацыя прафес. дзеячаў муз., харэагр. і эстр. мастацтва. Створаны ў 1991 на базе Муз. т-ва Беларусі (дзейнічала з 1987, з 1995 наз. С.м.дз.Б., з 1999 Бел. саюз муз. дзеячаў). Старшыня — М.Дрынеўскі. Асн. мэты: удзел у адраджэнні бел. нац. культуры, каардынацыя дзейнасці дзярж. устаноў і арг-цый, грамадскіх аб'яднанняў і грамадзян у вырашэнні праблем развіцця нац. культуры і мастацтва, удзел у абароне прафес. правоў сваіх членаў, павышэнне кваліфікацыі і выканаўчага майстэрства музыкантаў. Мае абл. арг-цыі і Мінскае гар. аддз., творчыя асацыяцыі: бел. цымбалістаў, дамрыстаў і мандаліністаў, перкусійная. Праводзіць канферэнцыі, майстар-класы з запрашэннем вядомых майстроў з замежных краін, садзейнічае і арганізуе ўдзел выканаўцаў у міжнар. муз. конкурсах, фестывалях, форумах. Заснавальнік і сузаснавальнік фестываляў «Сярэбраны звон цымбалаў» (1998, 2000), «Славянскі вянок» (1998), «Студзеньскія музычныя вечары» (з 1989), «Нараджэнне капэлы» (1991, 1992), конкурсаў муз. мастацтва. Працуе камбінат па вырабе, рамонце і рэстаўрацыі муз. інструментаў. Падтрымлівае сувязі з Сусв. цымбальнай асацыяцыяй (з 1992); калектыўны чл. Міжнар. саюза муз. дзеячаў (з 1991) і Бел. канфедэрацыі творчых саюзаў (з 1991). На 2001 каля 600 членаў.

Члены Беларускага саюза музычных дзеячаў

1991. Л.М.Абрамовіч, Л.К.Алексютовіч, І.У.Алоўнікаў, А.В.Альшанікаў, А.М.Аляксеенка, В.С.Ануфрыева, Г.В.Асмалоўская, І.А.Атраднаў, Н.П.Аўдзеева, В.Л.Аўраменка. Э.І.Ахрэмчык, В.А.Бабчанка, Г.І.Багамолаў, Б.П.Бажкоў, А.М.Баканаў, В.Я.Балаханаў, Л.Р.Батырава, Г.Я.Бацвіннік, М.А.Баяровіч, В.Ю.Бельшюкова, С.І.Берасцень, А.І.Берын, Л.М.Бондарава, Т.П.Брагінец, У.В.Браілоўскі, В.В.Варановіч, В.Дз.Васіленка, Л.П.Васільева, В.М.Верамяюк, Я.Г.Віданаў, Н.В.Вітчанка, В.В.Волкаў, М.М.Волкаў, В.Л.Вуячыч, І.Г.Вядзенін, Э.С.Габрыэлян, І.П.Галко, А.А.Галенчык, Я.А.Гарбунова, Г.Я.Гедыльтэр, Ю.М.Гільдзюк, Я.П.Гладкоў, Г.П.Грынчук, А.М.Гужалоўская, В.Ю.Густава, А.Ф.Гутараў, Л.І.Гучок, М.І.Дабравольскі, Б.І.Давыдаў, В.У.Дадзіёмава, Ю.П.Дзмітрыенка, А.А.Данілоўіч, Л.Л.Дзядук, М.П.Дрынеўскі, В.У.Дудкевіч, В.С.Жывалеўскі, І.А.Забелава, П.П.Забелаў, Г.П.Зелянкова, В.М.Зяленін, Л.Л.Іваноў, А.В.Кавалеўская, М.А.Казінец, М.А.Казлоў, П.Я.Кандрацюк, С.І.Кафанаў, А.П.Кірыенка, Э.В.Кірыленка, У.М.Кузменка, Л.М.Куляшоў, Т.М.Курыла, У.В.Курылін, В.А.Кучар, Э.В.Кучынскі, В.А.Лагвінена, Н.І.Лапшова, С.Ю.Лішчанка, А.А.Лысенка, І.М.Лявоненка, У.П.Ляйко, З.Я.Мажэйка, А.А.Мазепін, А.А.Мазурава, Л.П.Макарава, Р.Я.Малееў, А.А.Маляроў, Л.А.Матукоўская, Н.А.Мікуліч, А.П.Мільто, В.А.Міхальчук, Г.М.Міхеева, Л.А.Мішчанка, І.Б.Морых, Л.Б.Мураная, Л.Ф.Мурашка, Л.М.Мяцельская, Б.У.Нічкоў, Г.П.Обух, Р.У.Падойніцына, І.І.Палівода, В.М.Панін, Л.А.Папова, А.М.Папоў, У.С.Пархоменка, В.П.Пауля, І.І.Паўлава, У.П.Перлін, А.А.Піліпенка, В.П.Пісарчык, У.П.Правілаў, А.К.Прусаў, Я.Р.Пукст, А.В.Пякуцька, Б.М.Пянчук, А.С.Пячонкіна, Я.М.Раўтовіч, В.Л.Рахленка, А.М.Рашацян, У.А.Родаў, В.У.Роўда, А.А.Рудзькоў, С.І.Рудня-Герман, У.М.Рыжы, У.П.Рылатка, С.М.Рыхло, В.П.Савіцкая, Г.П.Салапаха, Р.С.Сарока, І.Ю.Семяняка, М.І.Сеўрукоў, Б.В.Сінецкі, У.П.Скараходаў, Э.М.Скуратава, А.С.Собалева, М.Р.Солапаў, Б.І.Спектар, У.І.Стасевіч, Н.С.Сцяпанская, У.В.Таран, В.В.Тупіцын, У.У.Федарчук, М.Я.Фінберг, А.І.Хімчанка, Н.Л.Хотылева, І.І.Хотылеў, В.Г.Чарныш, Ю.М.Чурко, Л.С.Шаламенцава, Я.А.Шаўчэнка, З.Б.Шаціла, С.Ю.Шпадарук, С.А.Штэйн, І.М.Шуміліна, В.Л.Яканюк, Т.С.Якаўлева, А.Б.Янпольскі, Л.І.Ячнеў. **1992**. Г.Р.Аляксандрава, Я.Ц.Анціпенка, Н.В.Аўраменка, А.А.Бальцэвіч, М.Д.Браценнікаў, П.М.Веркалаб, А.Б.Залётнеў, М.А.Зданевіч, Л.П.Івашкоў, Н.А.Кавецкая, Т.Я.Кандрацюк, Н.П.Каральчук, У.Дз.Каструлёў, З.В.Качарская, Р.А.Лагонда, Л.А.Лявонава, І.Б.Мазур, Г.М.Мандрус, Р.Т.Марціросаў, Л.Б.Метнер, Г.А.Мілешка, У.В.Неўдах, І.В.Неўская, У.М.Няхаенка, В.Л.Парашчанка, В.В.Паўлава, Р.І.Петрачэнка, М.Ф.Пракаповіч, Т.Л.Рыдлеўская, С.У.Сакірка, У.А.Сінельнік, В.С.Томаль, Т.У.Уладысік, Г.П.Церашонак, І.А.Чарапко, В.У.Шацкі, Г.В.Шпакоўскі, С.М.Шубіна, Ж.Г.Ялфімава, І.А.Янпольская. **1993**. П.С.Акулёнак, П.С.Вайналовіч, Я.Ш.Гелер, Я.У.Маланкоў, В.А.Патапаў, Г.І.Паўлянок, А.К.Сакалова, Ю.М.Сасноўцаў, Г.Я.Сівакова, Т.П.Сычова, І.Р.Целяпнёва. **1994**. І.Л.Аляхновіч, Г.В.Анікеева, В.А.Анікееў, Т.С.Асновіч, М.І.Ахвердава, І.І.Барташэвіч, Т.Ф.Бранкоўская, Г.І.Бранкоўскі, Т.У.Бялькова, І.У.Валадковіч, Л.Р.Верхавень, Т.С.Ворашань, Т.В.Дзяшко, А.В.Доўгань, В.П.Ждановіч, В.І.Іванова, В.А.Кандратовіч, А.В.Касаткіна, В.Р.Кірылава, У.Дз.Кокушкін, У.М.Колін, Н.М.Кончыц, Л.А.Корсак, Ю.А.Крылоў, В.А.Крыцкая, С.С.Кундзянок, П.Ф.Ліхтэн, І.М.Лонскі, Л.М.Ляўковіч, С.М.Малінін, С.А.Мікулік, Л.Р.Пазнякова, Л.А.Парашчанка, А.В.Пауля, Л.М.Пятрова-Кумінская, С.Т.Разін, І.Э.Раманава, В.Р.Раманцоў, С.М.Рыбарава, Р.П.Рыжэвіч, В.П.Рэва, Л.Б.Самарцава, Л.М.Сасноўская, С.Ф.Сіпакова, А.В.Сітнікаў, Дз.Дз.Смірнова, Л.В.Смір-

нова, М.К.Старасцін, Н.І.Ташчыліна, С.У.Федарынчык, Г.М.Хадыка, А.У.Хартановіч, А.У.Харытонава, Н.В.Храпцова, Н.М.Цапрылава, Т.Ц.Чупрынская, Т.Е.Шумакова, А.А.Шут, Л.В.Шыбаева, Л.А.Шымановіч. **1995**. А.Л.Акушэвіч, Л.П.Андрэева, Ю.Я.Андрэева, У.І.Арцымовіч, І.А.Аўсеева, М.В.Бяляева, Н.Р.Бандарэнка, С.Р.Барэйка, С.В.Бяляцкая, А.М.Бярнацкая, В.А.Войцік, А.Дз.Гуслева, М.А.Дзяруга, І.П.Дынькова, Л.М.Ермалаева, К.У.Еўсіевіч, Г.Л.Жаліхоўскі, В.П.Жданоніч, І.Г.Іваноў, В.С.Казлоўскі, Т.Л.Калянковіч, В.А.Кандраценка, М.А.Каралькоў, Г.К.Каранеўскі, Л.А.Клюйко, Т.В.Кузіна, В.У.Кузняцоў, Л.І.Леўчанка, Л.Л.Маеўскі, А.В.Маладцова, Г.В.Малеева, А.Ю.Мдывані, Э.К.Мімінашвілі, Л.Б.Новікава, В.А.Новікаў, В.П.Папова, Т.А.Парфёнава, Л.Ф.Патапенка, С.В.Перапеча, Я.У.Пятроў, В.А.Раманцова, В.Я.Садовін, Г.У.Семяненка, А.В.Сівакоў, В.А.Хаўкін, М.У.Ціракян, А.А.Чарнашэй, Н.М.Шпакоўская, В.І.Шрамко, А.Ф.Шунтаў, Л.Б.Шурман, В.М.Шчарбак, В.У.Шыкавец. **1996**. Ю.Г.Баханоніч, Г.М.Бруёк, І.Г.Вяршок, А.У.Гіраль, Л.І.Грудзініна, А.В.Грыгор'ева, В.К.Дзыгун, Н.П.Журовіч, Л.У.Зорына, В.А.Кіранава, Ч.А.Кулікоўскі, У.У.Лінькоў, Н.А.Лысенка, Т.Г.Мдывані, М.С.Мінянкова, А.С.Падольская, Т.А.Пяцко, Л.В.Равуцкая, У.Т.Рудзянкоў, Г.М.Смоляк, І.Ф.Сушко, А.П.Чарапко. **1997**. Н.І.Андрыянава, Л.І.Баранчык, Н.Б.Барынава, В.У.Бялугіна, М.І.Васілеўскі, Н.Г.Віцкоп, А.С.Вяргей, І.М.Гараніна, І.Дз.Гладкевіч, І.М.Грамовіч, В.А.Грэкава, Н.В.Гусарэвіч, Э.І.Давыдава, Т.В.Дземянкова, С.С.Дубасава, Л.М.Заруба, А.П.Ігнацьеў, М.В.Ільіна, С.М.Калеснікава, У.С.Каліна, В.С.Камарова, Л.К.Кардзянкова, Э.М.Кашэўскі, А.М.Красік, Э.К.Красніцкі, А.У.Красоўская, Н.У.Крыгер, І.І.Кундзянок, Л.М.Лагавік, Н.П.Мальцава, В.П.Марозава, А.А.Мартыненка, М.Н.Міхліч, В.Г.Мошчанка, Р.М.Мухаметшына, З.П.Пятрова, Т.М.Пятрова, І.А.Родава, Т.П.Роман, Л.М.Рудзянкова, В.А.Руднеў, Г.А.Рыдзігер, В.Я.Санько, Н.І.Сасіна, Л.Р.Сладзінская, У.М.Стукмейстэр, Н.К.Сянькова, В.У.Сяўрук, М.Я.Тарачэнка, А.А.Таўгень, Г.У.Томашава, Л.А.Фамічова, В.А.Чабан, І.А.Шчарбак, А.М.Шылкіна, Н.П.Яфімава, У.П.Яцыновіч. **1998**. І.Д.Аксюта, Н.А.Анісімава, Т.Ф.Арлоўская, І.М.Атчанашанка, І.А.Багданец, Т.В.Балсунова, А.В.Бараш, Р.Р.Вараб'ёў, В.В.Галуза, І.В.Гарбацюк, С.М.Гарбацюк, А.В.Груздзева, С.В.Гуткоўская, І.М.Дзяшко, У.К.Заремскі, В.М.Калеснік, А.Л.Карацееў, Л.З.Малініна, Н.М.Мачыхіна, Т.В.Молічава, І.С.Нарэйка, Н.В.Невяровіч, А.К.Прусаў, І.І.Пяганаў, І.У.Пякарская, Л.П.Пятрова, А.М.Сердзюкова, М.Э.Смоліч, Ю.У.Стэльмах, А.Я.Філіпенка, А.Р.Халшчанкоў, Н.І.Харкаўская, А.В.Цыганок, І.М.Шасцітка, У.Р.Шчэрба, Ю.У.Шыкунец. **1999**. Ж.В.Ануфрэйчык, А.Л.Арабей, Н.Г.Аруцюнава, І.Л.Аўдзееў, Т.А.Афанасьева, Л.М.Бабко, В.В.Баравікоў, Т.П.Боднева, С.С.Братухіна, П.С.Бяляеў, Н.І.Варывончык, А.Ф.Васілевіч, А.М.Вяршок, Н.В.Ганчарэнка, І.Б.Гембіцкая, А.Ю.Герасім, Т.С.Глушакова, У.В.Глушакоў, Л.І.Грабавая, Л.С.Грыневіч, В.Ю.Гурэева, А.Ц.Дабралёт, А.М.Данцыг, А.С.Дружыніна, А.А.Дударэнка, А.А.Елдзіна, У.А.Ермалаеў, І.Л.Жук, А.П.Зайцаў, І.А.Захарошка, Т.Ю.Ільіна, А.Я.Калядзіч, В.У.Карасёва, Т.М.Кірычэнка, А.А.Кнатэ, А.У.Кожух, А.М.Краўчэня, Р.Дз.Крывель, Т.А.Кукраш, І.М.Кулакова, М.А.Лабковіч, П.К.Лазука, А.М.Лаўрыеня, А.А.Лугаўцова, А.У.Лявіцкая, М.С.Мароз, А.У.Наполава, М.Я.Парахаўнічэнка, А.А.Пракаповіч, В.І.Пятрова-Кумінская, Л.Г.Раманчук, А.П.Рэут, Н.В.Сазановіч, А.А.Сакалова, В.І.Самасуева, Н.Л.Сапёлкіна, С.І.Селівон, С.М.Семяненя, А.М.Скорая, У.Г.Судноўскі, Ю.Ю.Тарасянок, У.М.Трафімовіч, В.В.Турэйка, В.П.Улазоўская, А.В.Цітова, С.А.Цітоў, І.М.Цыганок, Т.І.Часнакова, А.М.Чыркун, А.А.Шахаўцова, С.М.Шувалава, І.М.Шумілаў, У.П.Шышкін, Т.В.Ялецкая. **2000**. І.К.Абразевіч, А.І.Александровіч, Т.В.Алёнушкіна, З.В.Аўдоніна, У.М.Баглай, С.А.Байдак, Б.Дз.Баленка, В.А.Баннікава, Дз.В.Бацкіраў, Б.М.Бергер, В.Я.Браім, У.М.Будай, Л.А.Бурцава, Т.Г.Валадзько, Л.К.Валасюк, Я.А.Валасюк, М.А.Галавач, Т.А.Гер'ятовіч, К.С.Глазоўская, Т.М.Градкова, С.М.Грачыха, А.В.Гржыбоўская, Н.С.Гуркова, С.Я.Дабрадзенеў, В.У.Дамарацкая, Л.Г.Дружыніна, Т.М.Дубоўская, У.А.Дулаў, Л.М.Жукава, А.У.Жукаў, М.П.Журовіч, С.А.Жыгота, Н.У.Жэбіт, П.П.Запявалаў, Л.В.Зыкава, У.Ц.Зылікаў, Л.А.Зямцова, Т.П.Кавалеўская, Т.Я.Канавалава, Л.І.Капская, У.М.Каральчук, І.І.Карзевіч, Л.А.Карташова, В.С.Каспяровіч, М.І.Клімась, В.М.Крыловіч, Г.І.Крэс, І.В.Лашчыніна, Л.У.Леснічэнка, С.В.Літвінава, М.М.Лобан, В.П.Львова, В.А.Мальцава, Т.І.Марозава, М.П.Маршак, Г.А.Марыніч, В.М.Мішакоў, В.А.Нічыпарчык, Л.І.Пазырава, Н.У.Пахомава, Ж.М.Пракопава, Н.П.Пунчык, М.Ф.Радзеня, А.М.Русін, У.А.Семянюк, Т.Ю.Сергіеўскі, А.Л.Сідараў, В.В.Сікачова, В.Б.Сінецкая, А.В.Склема, А.Л.Судзібор, В.В.Сянькова, В.П.Трафімава, А.М.Трафімовіч, М.М.Траццякова, Л.С.Фёдарава, Т.М.Фралова, Н.В.Цакун, Н.Д.Чарадніцэнка, У.М.Чэрнікаў, В.Р.Шаўчэнка, Г.С.Шкурская, Ф.В.Юрцэвіч, Л.П.Юшкевіч. **2001**. Н.С.Азаранкава, Р.М.Аладава, Т.У.Амяльчэня, У.І.Афонін, С.С.Ахотнікава, Л.М.Багамолава, Н.У.Барысава, А.У.Бінькевіч, А.Дз.Босікаў, С.Э.Бузько, Л.І.Бухаўцова, Дз.І.Варонін, А.У.Вашуркіна, А.С.Волюс, А.І.Высоцкі, Г.К.Гарэлава, А.А.Герасімёнак, В.П.Генюш, С.Ф.Глінская, Л.У.Дарагуж, Л.М.Дзімохіна, М.А.Дзіда, С.А.Дзянісава, С.М.Дубовік, М.К.Жылін, С.К.Забаронак, К.Э.Ільіна, П.В.Казлоў, А.Ю.Калеснік, В.М.Канатопцава, А.В.Капцелаў, В.В.Капцелаў, К.С.Кафанава, А.А.Кірэйчанка, Н.В.Конюх, С.А.Коціна, Т.А.Краснабаева, А.Б.Круцько, І.Л.Курносаў, Н.С.Лазарава, Л.В.Ларыёнава, Дз.Дз.Латышава, М.К.Літвін, А.У.Лукашкова, С.Л.Лясун, В.Л.Мацкевіч, А.М.Мініна, А.К.Мядзведзева, А.В.Пазноўская, А.М.Паліўка, Н.В.Патапчук, Л.А.Паўлюк, А.А.Рамашкевіч, А.У.Рыбінцаў, І.П.Салтановіч, Н.К.Сінькевіч, Г.Ф.Сіўцоў, А.А.Слоціна, У.А.Старычэнка, А.Р.Ступянёў, С.А.Суцько, І.М.Тамашэвіч, Н.М.Татарынцава, Н.В.Чыж, Л.Л.Шынкевіч, Н.К.Юрэвіч. *Н.В.Вітчанка, Т.М.Курыла.*

САЮ́З НЯМЕ́ЦКІХ АФІЦЭ́РАЎ (Bund Deutscher Offiziere), антыфашысцкая арг-цыя ням. ваеннапалонных у СССР у 1943—45; адзін з асяродкаў супрацоўлення нацысцкаму рэжыму ў 2-ю сусв. вайну. Засн. на ўстаноўчай канферэнцыі 11—12.9.1943 у с. Лунёва пад Масквой (каля 100 дэлегатаў ад 5 афіцэрскіх лагераў ваеннапалонных; прэзідэнт — б. камандзір 51-га армейскага корпуса вермахта, ген. артылерыі В. фон Зайдліц-Курцбах). Узаемадзейнічаў з *Нацыянальным камітэтам «Свабодная Германія»* (НКСГ), падзяляў яго мэты, праграму і метады дзейнасці, у т.л. заклік «За свабодную, незалежную Германію, супраць Гітлера!». Да вясны 1945 аб'ядноўваў каля 4 тыс. б. генералаў і афіцэраў герм. арміі (сярод іх са жн. 1944 ген.-фельдмаршал Ф.*Паўлюс*). Распушчаны разам з НКСГ 2.11.1945.

Літ.: За Германию — против Гитлера!: Док. и материалы о создании и деятельности Нац. комитета «Свободная Германия» и Союза немецких офицеров: Пер. с нем. М., 1993.

У.Я.Калаткоў.

САЮ́З ПАЛЯ́КАЎ НА БЕЛАРУ́СІ, (СПБ; Związek Polaków na Białorusi), добраахвотнае нац.-культ. аб'яднанне грамадзян Беларусі, якія лічаць сябе палякамі. Створаны ў 1986. Мэты саюза: адраджэнне і захаванне польскай мовы і культуры, ахова помнікаў гісторыі, архітэктуры і экалогіі, каардынацыя сумеснай дзейнасці дзярж. і грамадскіх арг-цый у вырашэнні праблем духоўнага развіцця польскага этнасу на Беларусі. На 1999 у СПБ больш за 30 тыс. членаў. Паводле статута вышэйшым органам СПБ з'яўляецца з'езд, які склікаецца 1 раз у 4 гады. У перыяд паміж з'ездамі саюзам кіруе Гал. праўленне (знаходзіцца ў г. Гродна) на чале са старшынёй. Мае абл., гар., раённыя, мясц. пярвічныя арг-цыі. Найб. абл. арг-цыя пасля гродзенскай — Саюз палякаў на Міншчыне. СПБ удзельнічае ў правядзенні фестываляў, конкурсаў, аглядаў маст. самадзейнасці і інш. Хадайнічае перад Мін-вам адукацыі аб адкрыцці польскіх школ, збірае сродкі на іх фінансаванне. Падтрымлівае сувязі з Польшчай і польскай дыяспарай у свеце. Выдае газ. *«Głos znad Niemna»* і час. *«Magazyn polski»*. Пра нац.-культ. дзейнасць СПБ гл. таксама ў арт. *Палякі.*

А.І.Валаховіч.

САЮ́З ПО́ЛЬСКАГА НАРО́ДА, Садружнасць польскага народа (Stowarzyszenie Ludu Polskiego), польская тайная вызв. арг-цыя ў 1835—37. Створаны ў Кракаве на аснове арг-цый карбанарыяў эмігрантаў і прыхільнікаў арг-цыі «Маладая Польшча» (Ш.*Канарскі*, А. і Л. Залескія, С.Гашчынскі). Рыхтаваў паўстанне з мэтай аднаўлення Рэчы Паспалітай і правядзення прагрэс. сац.-эканам. рэформ (найперш скасаванне прыгону). Ідэалагічна быў блізкі да *«Дэмакратычнага таварыства»*. Складаўся пераважна са шляхты і інтэлігенцыі. Тэрытарыяльна падзяляўся на 5 правінцый: Кракаўская рэспубліка (там знаходзіўся цэнтр. орган — Гал. абшчына), Галіцыя, Пазнаншчына, Царства Польскае, Літва (б. ВКЛ, уключала Беларусь). Унутры саюза былі 2 плыні: радыкальна-дэмакр. і ліберальная, якія адрозніваліся адносінамі да сял. пытання, часу паўстання і інш. На тэр. Беларусі ў С.п.н. дзейнічалі Канарскі, А.Ажэшка (гл. *Ажэшкі*) і інш. У 1837 частка дзеячаў Саюза заснавала Усеаг. канфедэрацыю польскага народа з радыкальнай платф. праграмай. У выніку расколу ліберальнае кіраўніцтва прыняло рашэнне пра самароспуск арг-цыі.

САЮ́З ПО́ЛЬСКІХ ПАТРЫЁТАЎ (СПП; Związek Patriotów Polskich), масавая антыфашысцкая грамадска-паліт. арг-цыя палякаў-эмігрантаў у СССР у 1943—46. Створаны ў сак.—чэрв. 1943 у Маскве па ініцыятыве палякаў-камуністаў В.*Васілеўскай* (старшыня), С.*Ендрыхоўскага*, А.Завадскага, А.Лямпе і інш. СПП налічваў каля 100 тыс. членаў. Друкаваны орган газ. «Wolna Polska» («Свабодная Польшча»). Выступ-

паў за дэмакр. парламенцкі лад у паслявае. Польшчы, яе цесны саюз з СССР, прызнаваў правы СССР на Зах. Беларусь і Зах. Украіну, адмаўляў законнасць *Польскага ўрада ў эміграцыі*. СПП ініцыіраваў стварэнне *Першай польскай пяхотнай дывізіі імя Т.Касцюшкі* (1943), удзельнічаў у фарміраванні (21.7.1944) *Польскага камітэта нацыянальнага вызвалення*. Паліт. дзейнасць спалучаў з культ.-асв. і апякунскай працай: за гады існавання стварыў 248 школ, 52 дзіцячыя прытулкі, 636 бібліятэк і інш. У 1944—46 заахвочваў перасяленне палякаў з СССР у Польшчу. Спыніў існаванне ў жн. 1946. *Ю.В.Грыбоўскі.*

САЮ́З ПО́ЛЬСКІХ РАБО́ЧЫХ (СПР; Związek Robotników Polskich), рэвалюцыйная арг-цыя рабочых у Каралеўстве Польскім у 1889—93. Засн. Ю.*Мархлеўскім*, Я.Ледэрам і інш. ў Варшаве, аб'яднаў рабочыя гурткі і групы інтэлігенцыі. Заклікаў рабочых да сацыяліст. рэвалюцыі, арганізоўваў стачкі, першамайскія выступленні і інш. акцыі. Арг-цыі СПР існавалі ў гарадах Жырардаў, Лодзь, Згеж, Дамброва, Сасновец і інш. У 1893 увайшоў у склад партыі Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага (з 1900 *Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы*).

САЮ́З ПРАДПРЫМА́ЛЬНІКАЎ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, Беларускі саюз прадпрымальнікаў, арганізацыя, якая аб'ядноўвае кіраўнікоў прыватных прадпрыемстваў і грамадскіх аб'яднанняў, прадпрымальнікаў, журналістаў, эканам. і юрыд. экспертаў, абараняе іх правы і законныя інтарэсы. Створаны ў чэрв. 1991. Кіруючы орган — з'езд, які выбірае савет, прэзідэнта і віцэ-прэзідэнтаў саюза. Асн. кірункі дзейнасці: прадстаўленне інтарэсаў прыватнага бізнесу ў перагаворах з урадам, парламентам і прафсаюзамі; стварэнне прававога механізму забеспячэння абароны правоў прадпрымальнікаў; наладжванне кантактаў з міжнар. аб'яднаннямі прадпрымальнікаў і работадаўцаў; садзейнічанне экспарту прадукцыі і паслуг чл. саюза і інш.

«САЮ́З ПРАЛЕТАРЫ́ЯТУ ГО́РАДА І ВЁСКІ» («Związek Proletariatu Miasta i Wsi»), легальная арганізацыя Камуніст. рабочай партыі Польшчы (КПРП), створаная ў жн. 1922 з мэтай удзелу ў выбарах у сейм і сенат. Пазбаўленая магчымасці выступаць адкрыта, КПРП стварыла легальную выбарчую арг-цыю «С.п.г. і в.», ЦК якой выклаў выбарчую праграму партыі ў адозве. У Зах. Беларусі выбарчыя к-ты саюза дзейнічалі ў Брэсце, Беластоку, Гродне, Вільні, Кобрыне, Лідзе. Яны ядналі вакол сябе рэв. актыў, наладжвалі мітынгі, сходы, распаўсюджвалі камуніст. л-ру. Нягледзячы на рэпрэсіі ўлад, арышты актывістаў, ануляванне ў многіх выбарчых акругах бюлетэняў і спісаў, за кандыдатаў «С.п.г. і в.» пададзена больш за 132 тыс. галасоў, з іх у Зах. Беларусі 23 тыс.; пасламі (дэпутатамі) сейма абраны камуністы С.Ланцуцкі і С.Крулікоўскі. Саюз існаваў да пач. 1925; у 1923, 1924 ён удзельнічаў у выбарах у гар. рады і праўленні бальнічных кас. *І.П.Хаўратовіч.*

«САЮ́З ПРАЦВІТА́ННЯ», «Саюз дабрабыту», тайная арганізацыя *дзекабрыстаў* у 1818—21. Засн. на базе *«Саюза выратавання»*. Уваходзілі А.М. і М.М. Мураўёвы, С.І. і М.І. Мураўёвы-Апосталы, П.І.Песцель, І.Дз.Якушкін, М.С.Лунін і інш. Заканадаўчая ўлада ў «С.п.» належала Карэннай управе (30 заснавальнікаў), выканаўчая — Думе (6 чал.), мясц. ўправы існавалі ў Пецярбургу, Маскве, Тульчыне, Кішынёве і інш. Мэта «С.п.» — ліквідаваць самадзяржаўе, прыгонніцтва, увесці канстытуц. праўленне. Чл. саюза праз друк і літ.-асветныя т-вы ўздзейнічалі на грамадскую думку. Ідэйная барацьба ўнутры т-ва, неабходнасць адсеву ненадзейных членаў прывялі ў 1821 да яго роспуску. Найб. актыўныя члены арганізавалі *«Паўднёвае таварыства дзекабрыстаў»* і *«Паўночнае таварыства дзекабрыстаў»*.

«САЮ́З РУ́СКАГА НАРО́ДА», манархічная арг-цыя чарнасоценнага кірунку (гл. *Чарнасоценцы*) у Расіі ў 1905—17. Засн. 8.11.1905, карыстаўся маральнай і фін. падтрымкай урада. Цэнтр (Гал. савет) знаходзіўся ў С.-Пецярбургу. Паводле ўрадавых звестак у 1907 налічваў каля 350 тыс. чл. (правасл. духавенства, чыноўнікі, памешчыкі, гандляры, сяляне, рабочыя, рамеснікі і інш.), больш як 3 тыс. мясц. аддзелаў у 66 губернях. Кіраўнікі: А.І.*Дубровін*, У.М.*Пурышкевіч*, протаіерэй Іаан Кранштацкі, акад. А.І.*Сабалеўскі*, І.Я.Гурлянд і інш. Гал. друкаваны орган — газ. «Русское знамя». У Статуце саюза (1906) пад «рускім народам» разумеліся рускія, украінцы і беларусы; паводле некат. даследчыкаў, у бел. і ўкр. губернях знаходзілася каля 50% членаў «С.р.н.». Праграма саюза прадугледжвала захаванне адзінай непадзельнай Рас. імперыі, самадзярж. ладу, прыватнай уласнасці на зямлю, пераважнае становішча рускіх у дзяржаве, барацьбу з «засіллем іншародцаў» і панаваннем бюракратыі, паляпшэнне становішча працоўных. Саюз лічыў яўрэяў гал. арганізатарамі рэв. барацьбы і носьбітамі сацыяліст. ідэй, распальваў антысемітызм, які стаў прычынай шматлікіх яўр. пагромаў (у т.л. ў 1906 у Гомелі і Беластоку). На Беларусі актывістамі «С.р.н.» былі П.Р.*Бывалькевіч*, Л.М.*Саланевіч*, епіскап гомельскі Мітрафан і інш. Буйныя арг-цыі саюза дзейнічалі ў Аршанскім, Гомельскім, Быхаўскім, Лепельскім і інш. паветах, у гарадах Бабруйск, Пінск, Рэчыца і інш. У канцы 1910 у Гродне ўзнік філіял «С.р.н.» — «Гродзенскі рускі нацыянальны саюз». «С.р.н.» выступаў супраць бел. нац. руху, які лічыў прапольскім. 1910—11 мясц. арг-цыі саюза падбухторвалі сялян супраць памешчыкаў-палякаў. У 1908 са складу «С.р.н.» вылучыўся ультраправы *«Саюз Міхаіла Архангела»*, у 1911 — «Усерасійскі дубровінскі саюз рускага народа» на чале з Дубровіным. Пасля лют. рэвалюцыі 1917 «С.р.н.» самаліквідаваўся.

Літ.: Политическая история России в партиях и лицах. М., 1994; Кожинов В. «Черносотенцы» и революция. 2 изд. М., 1998. *Э.А.Ліпецкі.*

«САЮ́З РУ́СКІХ САЦЫЯ́Л-ДЭМАКРА́ТАЎ ЗА МЯЖО́Й», арганізацыя расійскіх паліт. эмігрантаў-марксістаў у 1894—1903. Засн. ў канцы 1894 у г. Жэнева (Швейцарыя) па ініцыятыве групы *«Вызваленне працы»* на ўмове прызнання ўсімі яго членамі праграмы групы. Выдаваў л-ру для Расіі, працаваў пад кіраўніцтвам групы «Вызваленне працы», якая ўваходзіла ў яго склад і рэдагавала (да канца 1898) усе яго выданні. У 1896—99 меў друкарню, выдаваў непярыяд. зб-кі «Работнік» і «Лісток «Работніка», працы У.І.*Леніна*, Г.В.*Пляханава* і інш., з 1899 — час. «Рабочее дело». Першы з'езд РСДРП (Мінск, 1898) прызнаў саюз замежным прадстаўніком партыі. З канца 1898 у саюзе пераважалі прыхільнікі плыні *«эканамізму»*, т. зв. маладыя. На 2-м з'ездзе арг-цыі (Жэнева, крас. 1900) адбыўся раскол: «Вызваленне працы» выйшла з саюза, які фактычна стаў арг-цыяй «эканамістаў». Распушчаны 2-м з'ездам РСДРП (1903).

САЮ́З САВЕ́ЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНЫХ РЭСПУ́БЛІК (СССР), Савецкі Саюз, шматнацыянальная федэратыўная дзяржава, якая існавала з снеж. 1922 да снеж. 1991 на б.ч. тэр. былой *Расійскай імперыі* і некат. прылеглых да яе землях. У 1989 пл. СССР складала 22,4 млн. км^2, нас. 286,7 млн. чал.; больш за 100 нацыянальнасцей. Сталіца — г.*Масква*. Утварэнне СССР

Герб і сцяг **Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік**.

САЮЗ САВЕЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК,
ПАЛІТЫКА- АДМІНІСТРАЦЫЙНАЯ КАРТА
МАСКВА Сталіцы дзяржаў
МІНСК Сталіцы саюзных рэспублік СССР
Казань Сталіцы АССР, цэнтры краёў і абласцей
Чэркеск Цэнтры аўтаномных абласцей і аўтаномных акруг
Певек Іншыя населеныя пункты
ГРАНІЦЫ
дзяржаў
саюзных рэспублік СССР
АССР, краёў і абласцей
аўтаномных абласцей
аўтаномных акруг
палярных уладанняў СССР
1 Валынская вобл.
2 Закарпацкая вобл.
3 Крымская вобл.
5 Мардоўская АССР
6 Чувашская АССР
7 Марыйская АССР
8 Удмурцкая АССР

ЛІЧБАМІ НА КАРЦЕ ПАЗНАЧАНЫ:

9 Комі-Пермяцкая аўт. акруга
10 Горна-Алтайская АВ
11 Хакаская АВ
12 Усць-Ардынская Бурацкая аўт. акруга
13 Агінская Бурацкая аўт. акруга
14 Яўрэйская АВ
15 Калмыцкая АССР
16 Стаўрапольскі край
17 Краснадарскі край
18 Адыгейская АВ
19 Карачаева-Чаркеская АВ
20 Кабардзіна-Балкарская АССР
21 Паўночна-Асяцінская АССР
22 Чэчэна-Інгушская АССР
23 Дагестанская АССР
24 Грузінская ССР
25 Абхазская АССР
26 Аджарская АССР
27 Паўднёва-Асяцінская АВ
28 Армянская ССР
29 Азербайджанская ССР
30 Нагорна-Карабахская АВ
31 Нахічэванская АССР
32 Усходне-Казахстанская вобл.
33 Каракалпакская АССР
34 Харэзмская вобл.
35 Сырдар'інская вобл.
36 Кашкадар'інская вобл.
37 Сурхандар'інская вобл.
38 Горна-Бадахшанская АВ

Маштаб 1:25 000 000

Заўвага. Назвы абласцей, аднайменных з цэнтрамі, на карце не падпісаны. Звесткі аб адміністрацыйным падзеле дадзены на 1990 г.


САЮЗ САВЕЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК
НАРОДЫ
Маштаб 1:24 000 000
ІНДАЕЎРАПЕЙСКАЯ СЯМ'Я
Славянская група
1 Рускія
2 Украінцы
3 Беларусы
4 Палякі
5 Балгары
Балтыйская група
6 Літоўцы
7 Латышы
Германская група
8 Немцы
Раманская група
9 Малдаване
Грэчаская група
10 Грэкі
Іранская група
11 Таджыкі
12 Прыпамірскія таджыкі: язгулемцы, бартангцы, рушанцы, шугнанцы, ішкашымцы, ваханцы
13 Курды
14 Талышы
15 Таты
16 Асеціны
Індыйская група
17 Цыганы
Армянская група
18 Армяне
19 Яўрзі
КАЎКАЗСКАЯ СЯМ'Я
Картвельская група
20 Грузіны (разам з аджарцамі)
Абхазска-адыгская група
21 Абхазы
22 Кабардзінцы
23 Чэркесы і адыгейцы
Нахска-дагестанская група
24 Чэчэнцы
25 Інгушы
26 Дагестанцы: а) аварцы, б) лакцы, в) даргінцы, г) табасараны, д) лезгіны, е) агулы, ж) рутульцы і інш.
УРАЛЬСКАЯ СЯМ'Я
Фінская група
27 Эстонцы
28 Карэлы
29 Фіны
30 Саамі (лапары)
31 Комі і комі-пермякі
32 Удмурты
20°
40°
50°
60°
70°
80°
90°
БЕРЛІН
КАПЕНГАГЕН
СТАКГОЛЬМ
ХЕЛЬСІНКІ
ВАРШАВА
МАСКВА
Ленінград
Петразаводск
Архангельск
Мурманск
Нар'ян-Мар
Варкута
Салехард
Сыктыўкар
Кіраў
Перм
Свярдлоўск
Чэлябінск
Омск
Новасібірск
Абакан
Караганда
Ташкент
Фрунзе
Алма-Ата
Душанбе
Ашхабад
Красноводск
Баку
Тбілісі
Ерэван
Махачкала
Гур'ев
Астрахань
Волгаград
Ростоў-на-Доне
Краснадар
Воронеж
Харкаў
Кіеў
Адэса
Львоў
Мінск
Віцебск
Рыга
Таллін
Горкі
Казань
Куйбышаў
Уфа
Дыксон
Паўночны палярны круг
ТЭГЕРАН
УКРАІНЦЫ
БЕЛАРУСЫ
ЛІТОЎЦЫ
ЛАТЫШЫ
ЭСТОНЦЫ
КАРЭЛЫ
РУСКІЯ
КАЗАХІ
КІРГІЗЫ
ТАДЖЫКІ
УЗБЕКІ
ТУРКМЕНЫ
ГРУЗІНЫ
КАЛМЫКІ
НЕНЦЫ
КОМІ
МАНСІ
ХАНТЫ
СЕЛЬКУПЫ
НЕНЦЫ

33 Марыйцы
34 Мардва

Угорская група
35 Ханты
36 Мансі

Самадзійская група
37 Нянцы (разам з энцамі)
38 Нганасаны
39 Селькупы

АЛТАЙСКАЯ СЯМ'Я

Цюркская група
40 Чувашы
41 Татары
42 Башкіры
43 Нагайцы
44 Кумыкі
45 Карачаеўцы
46 Балкарцы
47 Азербайджанцы
48 Гагаузы
49 Туркмены
50 Узбекі
51 Каракалпакі
52 Казахі
53 Кіргізы
54 Алтайцы
55 Хакасы
56 Тувінцы (разам з тафаларамі)
57 Шорцы
58 Якуты
59 Далганы

Манголькая група
60 Бураты
61 Калмыкі

Тунгуса-маньчжурская група
62 Эвенкі
63 Эвены
64 Амурскія народы: нанайцы, ульчы, оракі, удэгейцы, орачы

ЧУКОЦКА-КАМЧАЦКАЯ СЯМ'Я
65 Чукчы
66 Каракі
67 Ітэльмены

ЮКАГІРЫ
68 Юкагіры

НІЎХІ
69 Ніўхі

ЭСКІМОСКА-АЛЕУЦКАЯ СЯМ'Я
70 Эскімосы
71 Алеуты

КЕТЫ
72 Кеты

КАРЭЙЦЫ
73 Карэйцы

Тэрыторыі з насельніцтвам мяшанага нацыянальнага складу

Тэрыторыі з рэдкім насельніцтвам

Звесткі дадзены на 1989г.

было заканамерным працэсам і з'явілася вынікам паліт., ваен., эканам. і культ. інтэграцыі сав. рэспублік, якія ўзніклі пасля *Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917*. З моманту ўзнікнення сав. рэспублікі апынуліся ў рамках агульнага паліт. саюза з прычыны аднатыпнасці іх дзярж. сістэмы і канцэнтрацыі рэальнай улады ў руках адной Камуніст. партыі [рэспубліканскія кампартыі ўваходзілі ў РКП(б) на правах абл. арг-цый, гл. *Камуністычная партыя Савецкага Саюза*]. Пасля *грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі 1918—22* сав. рэспублікі былі аб'ектыўна зацікаўлены ў аднаўленні дзярж. адзінства: лягчэй было выстаяць у «капіталіст. атачэнні» і потым працягваць змаганне за «сусв. пралетарскую рэвалюцыю», аднавіць гаспадарку, развіваць эканоміку і культуру, забяспечыць сваю абараназдольнасць. Ужо 1.6.1919 утвораны ваен. саюз сав. рэспублік Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы і Беларусі. Ініцыятарамі стварэння СССР выступілі камуністы (бальшавікі). У 1920—21 умацаваліся гасп. сувязі сав. рэспублік, напярэдадні *Генуэзскай канферэнцыі 1922* склаўся іх дыпламат. саюз. У вер. 1922 спец. камісія ЦК РКП(б) прыняла падрыхтаваны І.В.*Сталіным* т. зв. «план аўтанамізацыі», згодна з якім інш. сав. рэспублікі ўваходзілі ў склад РСФСР на правах аўтаномій. Гэты план не атрымаў поўнай падтрымкі з боку рэспублік, зусім не прыняў яго ЦК кампартыі Грузіі. У.І.*Ленін* прапанаваў план афармлення адзінай дзяржавы з захаваннем за рэспублікамі атрыбутаў паліт. незалежнасці — у форме добраахвотнага саюза суверэнных і раўнапраўных сав. дзяржаў. Паколькі аўтарытэт Леніна быў бясспрэчным, ЦК РКП(б) і пераважная большасць сав. дзеячаў выказаліся за ленінскі план. На Беларусі Цэнтр. Бюро (ЦБ) КП(б)Б пастанавіла (16.9.1922) «лічыць мэтазгодным устанаўленне адносін паміж камісарыятамі Беларусі і камісарыятамі РСФСР аналагічныя з адносінамі, устаноўленымі паміж РСФСР і Украінай». Зыходзячы з таго, што адносіны РСФСР з Укр. ССР (УССР) будаваліся як адносіны дзвюх роўных незалежных рэспублік, гэта фактычна азначала, што ЦБ КП(б)Б было супраць сталінскага плана «аўтанамізацыі». Ідэю стварэння СССР аднадушна падтрымалі павятовыя парт. канферэнцыі, 6 павятовых і 116 валасных з'ездаў Саветаў Беларусі. У снеж. 1922 з'езды Саветаў УССР, БССР, Закаўказскай Сацыяліст. Федэратыўнай Сав. Рэспублікі (ЗСФСР; уваходзілі Армянская, Азербайджанская і Грузінская ССР) і X Усерас. з'езд Саветаў прызналі аб'яднанне сав. рэспублік у адзінай дзяржаве своечасовым. Актам утварэння СССР стаў Дагавор, які заключылі паміж сабой 4 рэспублікі — РСФСР, УССР, БССР і ЗСФСР (падпісаны разам з асобнай Дэкларацыяй 27.12.1922). Дагавор размежаваў кампетэнцыю паміж урадам СССР і рэсп. органамі выканаўчай улады. 30.12.1922 *Першы з'езд Саветаў СССР* зацвердзіў Дагавор і Дэкларацыю, дзе былі сфармуляваны асн. прынцыпы аб'яднання рэспублік: раўнапраўе і добраахвотнасць уваходжання іх у Саюз ССР, права свабоднага выхаду з Саюза і доступ у яго новым сав. сацыяліст. рэспублікам. З'езд зацвердзіў Дагавор аб утварэнні СССР, які прадугледжваў арганізацыю 10 саюзных наркаматаў, Вярх. суда і Аб'яднанага дзярж. паліт. ўпраўлення, вызначыў асновы ўзаемаадносін паміж вышэйшымі органамі ўлады СССР і саюзных рэспублік. Быў абраны вярх. орган улады Саюза ССР — Цэнтр. Выканаўчы К-т (ЦВК; старшыні М.І.*Калінін*, Р.І.*Пятроўскі*, А.Р.*Чарвякоў*, Н.Н.*Нарыманаў*). На 2-й сесіі ЦВК сфарміраваны ўрад СССР — Савет Нар. Камісараў (СНК) на чале з Леніным. Першая Канстытуцыя СССР (зацверджана 31.1.1924 на II з'ездзе Саветаў СССР) дэкларавала працоўным краіны шырокія дэмакр. правы і свабоды, актыўны ўдзел у кіраўніцтве дзяржавай. У сак. 1924 паводле прапаноў і хадайніцтваў ЦВК БССР Прэзідыум ЦВК СССР са згоды Усерас. Цэнтр. Выканаўчага К-та (ВЦВК) прыняў рашэнне аб вяртанні Беларускай ССР 16 паветаў Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губ.; у снеж. 1926 вернуты яшчэ 2 паветы (Гомельскі і Рэчыцкі), што значна ўзмацніла эканам. і культ. патэнцыял БССР. У ходзе далейшага працэсу нац.-дзярж. будаўніцтва ў склад СССР 13.5.1925 увайшлі Туркм. ССР і Узб. ССР (утвораны 27.10.1924), 5.12.1929 — Тадж. ССР (утворана 16.10.1929), 5.12.1936 — Казахская ССР і Кірг. ССР, 31.3.1940 — Карэла-Фінская ССР (з 1956 Карэльская АССР у складзе РСФСР), 2.8.1940 — Малд. ССР, 3—6.8.1940 — Літ. ССР, Латв. ССР і Эст. ССР (утвораны 21.7.1940). Канстытуцыя СССР 1936 абмежава-



ОБ ОБРАЗОВАНИИ СОЮЗА СОВЕТСКИХ СОЦИАЛИСТИЧЕСКИХ РЕСПУБЛИК

(Постановление принято в шестом заседании)

1. Признать своевременным объединение Российской социалистической федеративной советской республики, Украинской социалистической советской республики, Закавказской социалистической федеративной советской республики и Белорусской социалистической советской республики в Союз советских социалистических республик.

2. В основу объединения положить принцип добровольности и равноправия республик с сохранением за каждой из них права свободного выхода из Союза республик

3. Поручить делегации выработать совместно с делегациями Украины, Закавказской республики и Белоруссии проект декларации об образовании Союза республик с изложением обстоятельств, диктующих объединение республик в одно союзное государство.

4. Поручить делегации выработать условия вхождения РСФСР в Союз республик, обязав ее при рассмотрении союзного договора отстаивать следующие положения:

а) образование соответствующих союзных законодательных и исполнительных органов:

б) единые народных комиссариатов: военно-морского, путей сообщения, иностранных дел, внешней торговли и почт и телеграфов,

в) подчинение народных комиссариатов по финансам, продовольствию, народному хозяйству, труду и рабоче-крестьянской инспекции договаривающихся республик директивам соответствующих комиссариатов союзных республик;

г) полное обеспечение интересов национального развития народов договаривающихся республик.

5. Проект договора, до внесения его на первый съезд Союза республик, представить на одобрение Всероссийского центрального исполнительного комитета в лице его президиума.

Да арт. **Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік**. Дэкларацыя аб утварэнні СССР, прынятая I з'ездам Саветаў СССР 30.12.1922.

Да арт. **Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік**. Выступленне старшыні ЦВК СССР М.І.Калініна (10.10.1932) на адкрыцці Дняпроўскай гідраэлектрастанцыі каля г. Запарожжа на Украіне.

Да арт. **Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік**. Парад Перамогі. Масква. 24.6.1945.

ла паўнамоцтвы саюзных рэспублік. У ёй нічога не гаварылася пра тое, што суб'екты СССР перадаюць значную ч. паўнамоцтваў Саюзу, г. зн. дзейнічала не дагаворная, а канстытуцыйная норма. Павялічылася колькасць агульнасаюзных камісарыятаў. Утварэнне СССР дало магчымасць сканцэнтраваць сродкі для хуткага ажыццяўлення *індустрыялізацыі*, *калектывізацыі* сельскай гаспадаркі і культ. будаўніцтва, садзейнічала стварэнню буйнога эканам. патэнцыялу, які забяспечыў тэхніка-эканам. незалежнасць шматнац. дзяржавы, сав. рэспублік. У канцы 1930-х г. СССР па аб'ёмах прамысл. вытв-сці выйшаў на 2-е месца ў свеце пасля ЗША. Значныя асігнаванні з агульнасаюзнага бюджэту выдзяляліся гаспадарцы Беларусі. Напр., на буд-ва ф-кі штучнага валакна ў Магілёве, Крычаўскага цэментнага з-да, Бабруйскага і Гомельскага дрэваапрацоўчых камбінатаў, Гомельскага шклозавода і інш. аб'ектаў былі адпушчаны вялізныя на той час сумы. Хуткая суцэльная калектывізацыя вёскі дазволіла ўзяць у яе сродкі на патрэбы індустрыялізацыі і абароны краіны. Беларусь першай з рэспублік Саюза ССР на мяжы 1920—30-х г. ажыццявіла ўсеаг. абавязковае пач. навучанне і працягвала паступова ўводзіць усенавуч на базе сямігадовай школы. Разам з тым Камуніст. партыя кіравалася ідэямі «дзярж. сацыялізму», што абумовіла далейшую цэнтралізацыю ўлады, абмежаванне паўнамоцтваў саюзных рэспублік, адзяржаўленне нар. гаспадаркі, згортванне эканам.-матэрыяльных стымулаў. Стварэнне *адміністрацыйна-камандней сістэмы* выклікала сур'ёзныя скажэнні ў грамадска-паліт. жыцці краіны, масавыя *рэпрэсіі палітычныя* супраць грамадзян. Аднак нягледзячы на розныя хібы і дэфармацыі грамадства, за гады першых пяцігодак быў створаны магутны паліт. і сац.-эканам. патэнцыял, які дазволіў краіне, нягледзячы на вял. страты (27 млн. чал., 30% нац. багацця), выстаяць у барацьбе супраць фаш. Германіі, выпрацаваць цяжкія выпрабаванні *Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза 1941—45*, адстаяць сваю свабоду і незалежнасць. Савецкі народ і *Узброеныя сілы СССР* зрабілі вырашальны ўклад у выратаванне сусв. цывілізацыі ад фашызму. Важкім фактарам у дасягненні перамогі над Германіяй стаў *партызанскі рух на Беларусі* і ў інш. рэспубліках СССР. Пасля 2-й сусв. вайны міжнар. аўтарытэт СССР значна вырас. Сав. Саюз з'яўляўся чл. — заснавальнікам *Арганізацыі Аб'яднаных Нацый* (з крас. 1945) і адным з пастаянных членаў Савета Бяспекі ААН. Паводле рашэння *Сан-Францыскай канферэнцыі 1945*, скліканай з мэтай утварэння ААН, БССР разам з УССР былі ўключаны ў лік краін-заснавальніц гэтай новай і самай аўтарытэтнай міжнар. арг-цыі. Самаадданая праца і ўзаемадапамога народаў СССР далі магчымасць краіне хутка залячыць цяжкія раны вайны, аднавіць разбураную нар. гаспадарку, працягваць

Да арт. **Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік**. Сумеснае пасяджэнне Вярхоўнага Савета СССР, Вярхоўнага Савета РСФСР і ЦК КПСС, прымеркаванае да 50-годдзя СССР. Масква, снеж. 1972.

культ. будаўніцтва. У пасляваен. адраджэнні Беларусі ўдзельнічалі практычна ўсе сав. рэспублікі. У 1944—45 сродкі, атрыманыя БССР у даход яе дзярж. бюджэту з саюзных крыніц, склалі 55% іх агульнай сумы. Пасляваен. развіццё вызначыла ў значнай ступені далейшую спецыялізацыю Беларусі ў грамадскім падзеле працы, яе ролю ў стварэнні адзінага нар.-гасп. комплексу СССР. Гал. кірункам прамысл. развіцця Беларусі стаў паскораны рост машынабудавання, металапрацоўкі, электраэнергетыкі, паліўнай прам-сці, радыёэлектронікі, буд. матэрыялаў. У будаўніцтве многіх буйных прадпрыемстваў рэспублікі прымала ўдзел уся краіна. Важнай рысай у нац.-дзярж. палітыцы ў 1950-я г. стала пашырэнне правоў і ініцыятыў саюзных рэспублік. У маі 1955 зменены парадак планавання і фінансавання нар. гаспадаркі рэспублік СССР. Замест ранейшага парадку зацвярджэння ўрадам СССР дэталёвых паказчыкаў па развіцці рэсп. прам-сці, сельскай гаспадаркі, культуры, аховы здароўя цяпер вызначаўся толькі агульны аб'ём валавой і таварнай прадукцыі, а таксама капіталаўкладанняў па саюзных рэспубліках. Канкрэтнае планаванне аб'ёму вытв-сці і капіталаўкладанняў па прадпрыемствах і ведамствах было перададзена ў распараджэнне рэсп. саветаў міністраў. Яны атрымалі права выкарыстоўваць дадаткова выяўленыя і атрыманыя пры выкананні рэсп. бюджэту даходы на фінансаванне жыллёвай і камунальнай гаспадаркі, сац.-культ. мерапрыемстваў. Пашырыліся і паўнамоцтвы саветаў міністраў саюзных рэспублік у кіраўніцтве прам-сцю і буд-вам. У распараджэнне рэспублік у 1956 перададзены функцыі па кіраўніцтве работай судовых устаноў і органаў юстыцыі. Канцэнтрацыя навук. і вытв. сіл, матэрыяльных сродкаў на важнейшых кірунках навукі і тэхнікі прывяла да значных дасягненняў: створана ўласная *ядзерная зброя* (канец 1940 — пач. 1950-х г.), пабудавана першая ў свеце АЭС (1954), запушчаны першы штучны спадарожнік Зямлі (1957), першы касм. карабель з чалавекам — Ю.А.*Гагарыным* (1961); дасягнуты ваенна-стратэгічны парытэт з ЗША. У 2-й пал. 1980-х г. СССР займаў 1-е месца ў свеце па здабычы нафты, газу і жалезнай руды, выплаўцы чыгуну і сталі, вытв-сці коксу, трактароў, мінер. угнаенняў і некат. інш. відаў прадукцыі. Але выкарыстанне паліўна-энергет., сыравінных і інш. матэрыяльных рэсурсаў на адзінку нац. даходу ў 2—3 разы перавышала аналагічныя паказчыкі вядучых зах. краін. З пач. 1970-х г. усё больш пачалі выяўляцца адмоўныя рысы «дзярж. сацыялізму» (абмежаванне

Да арт. **Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік**. Выстаўка дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. Масква. 1980-я г.

дэмакратыі, адхіленне працоўных ад уласнасці і ўлады, парушэнні прынцыпаў сац. справядлівасці, бюракратызацыя дзярж. апарату і інш.), што прывяло да паглыблення крызісных з'яў. У якасці прававой нормы ў арт. 6 Канстытуцыі СССР 1977 было замацавана, што «кіруючай і накіроўваючай сілай савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый з'яўляецца Камуністычная партыя Савецкага Саюза». Спробы паскорыць сац.-эканам. развіццё на аснове канцэпцыі *перабудовы* (з сярэдзіны 1980-х г.) станоўчых вынікаў не прынеслі. Узмацніліся цэнтрабежныя тэндэнцыі ў саюзных рэспубліках, іх імкненне да суверэнітэту. Прычыны будучага распаду СССР, якія намеціліся ў канцы 1980-х г., заключаліся таксама ў абмежаванні паўнамоцтваў саюзных рэспублік, кансервацыі многіх адсталых форм арганізацыі грамадства (кланавасць, пратэкцыянізм, бюракратыя), дыктаце цэнтра ў эканам. монаразвіцці без уліку асаблівасцей кожнай рэспублікі, перараджэнні парт., дзярж. і інтэлектуальнай эліты ў асобны клан алігархаў, скажэннях у духоўным жыцці народаў (уніфікацыя адукацыі і асветы, моўная *асіміляцыя*), наяўнасці нац. нігілізму пад сцягам барацьбы з нацыяналізмам, намаганнях Захаду да скасавання СССР як гал. перашкоды на шляху да сусв. панавання т. зв. «заходніх каштоўнасцей» у выглядзе «новага парадку», дапамозе зах. колаў групоўкам і плыням некамуніст. скіраванасці, што тады дзейнічалі ў саюзных рэспубліках. Абвастрэнне супрацьстаяння дзвюх грамадска-паліт. сістэм, гонка ўзбраенняў, уцягванне СССР у ходзе змагання з Захадам у лакальныя канфлікты 1970—80-х г. (Афганістан, Ангола і інш.) аслаблялі эканоміку шматнац. сав. дзяржавы. Усё гэта паступова прыводзіла да радыкалізацыі палітыкі саюзных рэспублік, якія былі незадаволены няўдалымі рэформамі, няздольнасцю федэральнага цэнтра вырашаць складаныя праблемы. Скасаванне ў сак. 1990 арт. 6 Канстытуцыі СССР 1977 паскорыла распад шматнац. дзяржавы. У сак. 1990 Вярх. Савет Літвы абвясціў аб «аднаўленні незалежнасці Літоўскай дзяржавы», скасаванні дзеяння Канстытуцыі Літ. ССР і Канстытуцыі СССР на тэр. рэспублікі. У крас. 1990 аб незалежнасці сваіх рэспублік заявілі Вярх. Саветы Латвіі і Эстоніі. Працэс суверэнізацыі закрануў і інш. рэспублікі, хаця напачатку яны не заяўлялі аб выхадзе з СССР.

Спроба захаваць Саюз з усімі атрыбутамі ўлады была зроблена ў Законе СССР «Аб размеркаванні паўнамоцтваў паміж Саюзам ССР і суб'ектамі федэрацыі» (крас. 1990). Рэспублікі атрымлівалі магчымасць уступаць паміж сабой у эканам. супрацоўніцтва, наладжваць адносіны з замежнымі дзяржавамі, прымаць удзел у міжнар. арг-цыях. Аднак гэта не спыніла імкнення саюзных рэспублік да незалежнасці. 12.6.1990 прыняў Дэкларацыю аб дзярж. суверэнітэце з'езд нар. дэпутатаў РСФСР. 16.7.1990 дакумент адпаведнай накіраванасці прыняў Вярх. Савет Украіны. 27.7.1990 *Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі* зацвердзіў Вярх. Савет БССР. Яна абвясціла вяршэнства на тэр. рэспублікі Канстытуцыі Бел. ССР і яе законаў. У гэтых умовах кіраўніцтва СССР паспрабавала распрацаваць праект новага саюзнага дагавора (ліст. 1990). Аднак нават такая ініцыятыва цэнтра з боку кіраўнікоў суверэнных рэспублік шырокай падтрымкі не знайшла. IV з'езд нар. дэпутатаў СССР (снеж. 1990) прыняў рашэнне аб правядзенні 17.3.1991 рэферэндуму па пытанні аб СССР. У галасаванні ўдзельнічала 80% выбаршчыкаў. За захаванне СССР выказалася 76,4% галасаваўшых, супраць — 21,7%. Улады Грузіі, Літвы, Малдовы, Латвіі, Арменіі і Эстоніі не выканалі рашэнні IV з'езда нар. дэпутатаў СССР аб правядзенні рэферэндуму. У той жа час на Беларусі больш за 80% галасаваўшых выказаліся за захаванне СССР. Вясной і летам 1991 прэзідэнту СССР М.С.*Гарбачову* (з сак. 1990) на кансультацыях і перагаворах з кіраўніцтвам саюзных рэспублік у падмаскоўнай рэзідэнцыі Новае Агарова («Новаагароўскі працэс») удалося падрыхтаваць і 23 ліп. ўзгадніць праект новага саюзнага дагавора, які пры значным звужэнні ролі цэнтра прадугледжваў захаванне адзінай дзяржавы. Спроба групы парт. і дзярж. кіраўнікоў (Дзярж. к-т па надзвычайным становішчы, 19—21 жн.) увесці надзвычайнае становішча ў шэрагу рэгіёнаў СССР, выклікала адмоўную рэакцыю ў кіраўніцтве РСФСР і інш. рэспублік. Урадамі і Вярх. Саветамі суверэнных рэспублік быў канчаткова ўзяты курс на незалежнасць. 25—26.8.1991 нечарговая сесія Вярх. Савета БССР прыняла Закон «Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі», пастанову аб забеспячэнні паліт. і эканам. самастойнасці Беларусі. 19.9.1991 Вярх. Савет прыняў Закон аб назве Бел. ССР, у адпаведнасці з якім яна пачала называцца Рэспублікай Беларусь. У ліст. 1991 кіраўнікі саюзных рэспублік адмовіліся падпісаць падрыхтаваны Гарбачовым новы тэкст саюзнага дагавора. 8.12.1991 у Белавежскай пушчы (у бел. урадавай рэзідэнцыі Віскулі, Камянецкі р-н) кіраўнікі Беларусі, Расіі і Украіны падпісалі *Белавежскія пагадненні 1991* аб стварэнні *Садружнасці Незалежных Дзяржаў* (СНД), у якім канстатавалі, што «Саюз ССР як суб'ект міжнароднага права і геапалітычная рэальнасць спыняе сваё існаванне». 10.12.1991 Вярх. Саветы Беларусі і Украіны, 12.12.1991 Вярх. Савет Расіі ратыфікавалі Пагадненне аб стварэнні СНД і дэнансавалі Дагавор 1922 аб утварэнні СССР. 21.12.1991 была прынята Алма-Ацінская дэкларацыя кіраўнікоў 11 незалежных дзяржаў (Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана, Узбекістана і Украіны), у якой зноў было пацверджана: «З утварэннем Садружнасці Незалежных Дзяржаў Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік спыняе сваё існаванне».

Да арт. **Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік**. Галоўны канструктар касмічных караблёў С.П.Каралёў (справа) і першы касманаўт Зямлі Ю.А.Гагарын. 1960-я г.

Да арт. **Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік**. Беларуская ўрадавая рэзідэнцыя Віскулі (Белавежская пушча), дзе 8.12.1991 падпісаны Белавежскія пагадненні аб спыненні існавання СССР і ўтварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Кр.: Образование СССР: Сб. док. М., 1972; Несостоявшийся юбилей: Почему СССР не отпраздновал своего 70-летия? М., 1992.

Літ.: Бараноўскі Я.І. За дружбу народаў. Мн., 1972; Ленін У.І. Да пытання аб нацыянальнасцях, або аб аўтанамізацыі // Тв. Т. 36 (Полн. собр. соч. Т. 45); История национально-государственного строительства в СССР, 1917—1978. Т. 1—2, М., 1979; Ракашевич В.К. Конституция СССР — интернационализм в действии. Мн., 1980; Бармичев В.Д. Союзу республик — шесть-

десят. Мн., 1982; Куличенко М.И. Национальные отношения в СССР и тенденции их развития. М., 1972; Национальные отношения и национальные процессы в СССР: вопр. истории. М., 1990; Ненароков А.П. К единству равных: Культ. факторы объединительного движения сов. народов, 1917—1924. М., 1991; Игнатенко И.М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии. Мн., 1992; Абдулатипов Р.Г., Болтенкова Л.Ф., Яров Ю.Ф. Федерализм в истории России. Кн. 1—3. М., 1992—93; Доронченков А.И. Межнациональные отношения и национальная политика в России: актуал. пробл. теории, истории и современ. практики: Этнополитол. очерк. СПб., 1995; Круталевич В.А. На путях национального самоопределения: БНР—БССР—РБ. Мн., 1995; Боффа Дж. От СССР к России: История неоконченного кризиса, 1964—1994: Пер. с итал. М., 1996; Чешко С.В. Распад Советского Союза: Этнополитич. анализ. М., 1996; Хоскинг Д. История Советского Союза, 1917—1991: Пер. с англ. 2 изд. М., 1995; Национальная политика России: история и современность. М., 1997; Бабурин С.Н. Территория государства: Правовые и геополитич. пробл. М., 1997.

У.Я.Казлякоў, І.А.Літвіноўскі.

САЮ́З САЮ́ЗАЎ, аб'яднанне прафесійна-палітычных саюзаў у час *рэвалюцыі 1905—07 у Расіі*. Зарадзіўся ў канцы 1904, у ходзе «банкетнай кампаніі» (120 банкетаў пад паліт. лозунгамі ў 34 гарадах), афармёўся ў 1905—06. Уключаў 20 усерас. саюзаў (інжынераў і тэхнікаў, акадэмічны, адвакатаў, земцаў-канстытуцыяналістаў, раўнапраўя жанчын, сялянскі і інш.) і каля 40 мясц. аддзяленняў; усяго каля 135 тыс. членаў (без Усерас. сял. саюза) — у асноўным інтэлігенцыя і служачыя. Гал. патрабаванне — скліканне Устаноўчага сходу і ўвядзенне паліт. свабод. Дзейнічаў у кантакце з Пецярб. саветам рабочых дэпутатаў (у снеж. 1905 дэлегаваў у яго склад сваіх членаў), удзельнічаў у *кастрычніцкай усерасійскай палітычнай стачцы 1905*, паліт. забастоўках у ліст. і снеж. 1905 у Пецярбургу, Маскве, аказваў фін. падтрымку рэв. партыям і арг-цыям, даваў сродкі на ўзбраенне баявых дружын, дапамагаў б. палітзняволеным. Распаўся ў 1906 у сувязі з забаронай паліт. дзейнасці прафсаюзаў і іх аб'яднанняў.

«САЮ́З СПРАВЯДЛІ́ВЫХ», тайная паліт. арг-цыя ў эміграцыі перыяду ранняга ням. рабочага руху. Засн. ў 1836—37 у Парыжы. Ідэалогія — *утапічны сацыялізм*, пераважна ідэі *В.Вейтлінга* (гал. тэарэтык саюза). Супрацоўнічаў з франц. тайнымі т-вамі: у 1839 у Парыжы ўдзельнічаў у паўстанні бланкістаў (гл. *Л.А.Бланкі*). Пасля яго паражэння цэнтр саюза перамясціўся ў Швейцарыю, потым у Лондан, інтэрнацыяналізаваўся, пад уплывам *К.Маркса* і *Ф.Энгельса* члены арг-цыі адышлі ад рэв.-змоўніцкіх поглядаў і засвоілі марксісцкае вучэнне. У 1847 Маркс і Энгельс уступілі ў арг-цыю і рэарганізавалі яе ў *Саюз камуністаў*.

Літ.: Союз коммунистов, 1836—1849: Сб. док. М., 1977; Павленко Г.В. Вильгельм Вейтлинг. М., 1985.

«САЮ́З ТРОХ ІМПЕРА́ТАРАЎ», сукупнасць пагадненняў паміж Расіяй, Германіяй і Аўстра-Венгрыяй у 1873—84. Пачаты пагадненнем Аўстра-Венгрыі і Расіі, падпісаным 6.6.1873 Аляксандрам II і Францам Іосіфам I; 23.10.1873 да яго далучылася Германія. Пагадненне прадугледжвала агульнасць палітыкі, кансультацыі ў выпадку ўскладнення міжнар. становішча. Імператары абавязваліся сілай падтрымліваць мір у Еўропе. Уступленнем у саюз Расія імкнулася не дапусціць змовы Аўстрыі і Германіі за кошт яе інтарэсаў на Балканах, захаваць землі, набытыя ў Сярэдняй Азіі ў выпадку абвастрэння супярэчнасцей з Англіяй; Германія — перашкодзіць збліжэнню Францыі і Расіі. Саюз не быў трывалым і не ліквідаваў супярэчнасцей паміж саюзнікамі. Калі руска-герм. адносіны пагоршалі, Германія і Аўстрыя ў 1879 заключылі тайны дагавор, накіраваны супраць Расіі. Баючыся далейшага збліжэння Германіі і Аўстра-Венгрыі, Расія згадзілася аднавіць саюз, і ў 1881 быў заключаны руска-аўстрыйска-герм. дагавор, які абавязваў гэтыя дзяржавы трымацца нейтралітэту ў выпадку вайны адной з іх з інш. дзяржавай. Бакі абавязваліся лічыцца з інтарэсамі адзін аднаго на Балканах і не дапускаць змены граніц Турцыі. У 1884 дагавор прадоўжаны на 3 гады. У 1887 заменены рус.-герм. дагаворам.

Літ.: Сказкин С.Д. Конец австро-русско-германского союза. М., 1974.

САЮ́З ТЭАТРА́ЛЬНЫХ ДЗЁЯЧАЎ БЕЛАРУ́СІ, Беларускі саюз тэатральных дзеячаў, добраахвотная грамадская творчая арганізацыя работнікаў тэатра Беларусі: артыстаў, рэжысёраў, балетмайстраў, дырыжораў, хормайстраў, мастакоў, тэатразнаўцаў і інш. Створаны ў 1987 на базе Бел. тэатр. т-ва (засн. 7.6.1946), з 1994 наз. Бел. саюз тэатр. дзеячаў. Вышэйшы кіруючы орган — з'езд, выканаўчы — рада. З'езды адбыліся ў 1987, 1992, 1997, 1999. Старшыні — Л.Александроўская (з 1946), М.Яроменка (з 1976), А.Дудараў (з 1992). Мае на мэце садзейнічанне развіццю бел. сцэн. мастацтва, стварэнне спрыяльных умоў для творчасці дзеячаў тэатр. мастацтва, правядзенне творчых вечароў, бенефісаў, тэатр. свят, ушанаванне памяці выдатных прадстаўнікоў тэатр. мастацтва Беларусі. Арганізоўвае канферэнцыі, лабараторыі і семінары па пытаннях тэорыі і практыкі тэатр. мастацтва. Арганізоўвае і праводзіць фестывалі, выстаўкі, аўкцыёны, канцэрты і інш. Ажыццяўляе выдавецкую і рэкламную дзейнасць. На 1.2.2001 у С.т.дз.Б.1055 членаў.

«САЮ́ЗМУЛЬТФІ́ЛЬМ», расійская студыя анімацыйных фільмаў. Засн. ў 1936 у Маскве. Гл. таксама раздзел Кіно ў арт. *Расія*.

САЮ́ЗНАЯ ЛІ́ГА, рэвалюцыйная арганізацыя ў Кітаі ў пач. 20 ст., гл. *Тунмэнхой*.

САЮ́ЗНІКІ ў першай сусветнай вайне 1914—18, гл. ў арт. *Антанта, Траісты саюз*.

САЮ́ЗНІКІ ў другой сусветнай вайне 1939—45, гл. ў арт. *Антыгітлераўская кааліцыя, Германа-італьянскі дагавор 1939, Берлінскі пакт 1940*.

САЮ́ЗНІКІ рымскія (socii), абшчыны і плямёны, падпарадкаваныя Стараж. Рымам. Пасля страты суверэнітэту ў 338 да н.э. С. не мелі права весці самаст. знешнюю палітыку, павінны былі дапамагаць Рыму войскамі і матэрыяльнымі сродкамі ў час вайны і аддаваць рым. каланістам ч. сваёй зямлі. Паводле асноў самакіравання і правоў, якія даваліся С. у Рыме, абшчыны падзяляліся на розныя катэгорыі. Прывілеяваную групу складалі т. зв. лацінскія С., якія карысталіся поўным самакіраваннем і некат. грамадз. правамі ў Рыме. Большасць грэч. полісаў Італіі былі ўласна С.; іх жыхары, маючы самакіраванне, не валодалі ніякімі правамі рым. грамадзянства. Ніжэйшай катэгорыяй С. з'яўляліся дэдытыцыі; яны карысталіся абмежаваным самакіраваннем і не мелі правоў рым. грамадзянства. Да гэтай катэгорыі належалі б. члены самніцкай федэрацыі (гл. *Самніты*). Пытанне аб наданні С. правоў рым. грамадзянства ставілася яшчэ ў 2-й пал. 2 ст. да н.э., аднак было вырашана толькі ў выніку паўстання італійскіх плямён (гл. *Саюзніцкая вайна 90—88 да н.э.*). З канца 2 ст. да н.э. рым. правіцелі пасялялі ў межах імперыі варварскія плямёны ў якасці С., або федэратаў. Тытул «С. і прыяцель рым. народа» атрымлівалі ад Рыма правіцелі дружалюбных васальных царстваў (напр., цар Нумідыі *Масініса* і інш.).

Літ.: Нечай Ф.М. Рим и италики. Мн., 1963; Маяк И.Л. Взаимоотношения Рима и италийцев в III—II вв. до н.э. М., 1971.

САЮ́ЗНІЦКАЯ ВАЙНА́ 90—88 да н.э. (паводле інш. звестак 91—88), вайна паўстаўшых італійскіх плямён супраць Рымскай рэспублікі. Прычынай вайны стала адмова рым. сената даць правы рым. грамадзянства італійскім саюзнікам. Паўстанцы стварылі саюз «Італія» з цэнтрамі ў гарадах Карфіній і Бавіянум на чале з Саветам пяцісот. Іх армія дасягала 200 тыс. чал. у 90 да н.э. Першым супраць рымлян выступіла італійскае племя марсаў (таму С.в. часам наз. Марсійскай). Вайна ішла з пераменным поспехам. Рымляне вымушаны былі даць правы грамадзянства ч. *італікаў*, якія не ўдзельнічалі ў вайне (практычна этрускам і умбрам). У 89 да н.э. яны абяцалі зрабіць гэта і ў адносінах да паўстанцаў, якія складуць зброю на працягу 60 дзён. Гэта раскалола рады паўстанцаў. Летам 88 да н.э. супраціўленне італікаў было зломлена. У выніку С.в. ўсё свабоднае насельніц-

тва Італіі атрымала, хоць і з абмежаваннямі, правы рымскага грамадзянства.

Літ.: Нечай Ф.М. Рим и италики. Мн., 1963; Göhler J. Rom und Italien. Breslau, 1939.

Дзяўчынка ў **саяне**. Вёска Рудня-Барталамееўская Чачэрскага раёна Гомельскай вобл. Пач. 20 ст.

САЮ́ЗНЫ САВЕ́Т ДЛЯ ЯПО́НІІ. Існаваў у 1945—52. Створаны ў адпаведнасці з рашэннем нарады міністраў замежных спраў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі ў Маскве (снеж. 1945) як кансультацыйны орган саюзных дзяржаў пры амер. галоўнакамандуючым акупацыйнымі войскамі саюзнікаў у Японіі. Знаходзіўся ў Токіо. Уключаў прадстаўнікоў ЗША, СССР, Кітая, Вялікабрытаніі (апошні прадстаўляў таксама Аўстралію, Новую Зеландыю і Індыю), Нідэрландаў; пазней да іх далучыліся прадстаўнікі Пакістана і М'янмы. Меў права прыпыняць рашэнні амер. акупацыйнай адміністрацыі да ўзгаднення пытання з усімі членамі савета. У цэлым адыгрываў станоўчую ролю ў распрацоўцы агульнай паліт. лініі саюзнікаў у справе пераўтварэнняў пасляваен. Японіі (аграрная рэформа, дэмакратызацыя паліт. жыцця і інш.). Распушчаны ў крас. 1952 пасля ўступлення ў сілу *Сан-Францыскага мірнага дагавора 1951.*

САЯ́Н, спадніца з прышыўным ліфам-гарсэтам; састаўная частка нар. жаночага адзення беларусаў Падняпроўя ў 19 — пач. 20 ст. Шылі з баваўняных ільняных тканін з вузкімі плечавымі шлейкамі ліфа і глыбокім выразам проймы. Спадніцу звычайна кроілі з 4 полак андарачнай тканіны, ліф-гарсэт — з фабрычнай (аксаміт, сацін, шарсцянка, парча, шоўк). У паўн.-ўсх. раёнах С. шылі з ільняных пярэстатканых ці маляўніча-набіваных тканін сіняга ці блакітнага колеру. Апраналі паверх кашулі і падпяразвалі вузкім поясам. На Беларусь С. трапіў, відаць, з Зах. Еўропы, дзе быў верхнім адзеннем феад. знаці і духавенства ў 16—18 ст. (шылі з аксаміту, парчы, сукна пераважна чорнага, сіняга, шэрага колераў; складаўся з 2 частак — шчыльнага ліфа з лямкамі або кароткімі рукавамі і фалдзістага нізу). Сустракаецца ў адзенні рускіх, украінцаў (*сарафан*).

М.Ф.Раманюк.

САЯ́НА-ШУ́ШАНСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. На р. Енісей, у Краснаярскім краі і Рэспубліцы Тыва, у Расіі. Утворана плацінай аднайм. ГЭС. Запоўнена ў 1978—95. Пл. 633 км^2, аб'ём 29,1 км^3, даўж. 290 км, найб. шыр. 9 км. Сезоннае рэгуляванне сцёку, ваганні ўзроўню вады да 4,2 м. Стварае ўмовы для нармальнага суднаходства па Енісеі да г. Кызыл.

Саяна-Шушанскае вадасховішча.

САЯ́НЫ, горная краіна ў Паўд. Сібіры ў Расіі. Распасціраецца ад Усх. Алтая, Абаканскага хр. і Кузнецкага Алатау на З амаль да воз. Байкал на У. Складаецца з шматлікіх хрыбтоў, якія ўтвараюць выгнутую на Пн дугу. Паміж хрыбтамі замкнёныя катлавіны. Найвыш. пункт г. Мунку-Сардык (3491 м). У араграфічных адносінах падзяляюцца на 2 горныя сістэмы: *Заходні Саян* і *Усходні Саян.*

САЯ́Т-НАВА́ (сапр. Саядзян Арцюн; 1712, Тбілісі — 1795), армянскі паэт; буйнейшы прадстаўнік свецкай паэзіі позняга сярэдневякоўя. Быў прыдворным песняром і музыкантам груз. цара Іраклія II. Выгнаны са службы з-за сутычак з вяльможамі, стаў свяшчэннікам, з 1768 манах. Праславіўся як *ашуг.* Пісаў песні на арм., груз. і азерб. мовах, у якіх традыц. для ўсх. паэзіі вобразнасць спалучалася з глыбокай эмацыянальнасцю, пратэстам супраць сац. несправядлівасці. Майстар любоўнай лірыкі («Я хворы каханнем да цябе», «Каманча», «Да салаўя», «Так жыць хачу» і інш.). Забіты ў Тбілісі ў час нашэсця перс. войск. На бел. мову асобныя яго вершы пераклалі Х.Жычка, Н.Тулупава.

Тв.: Рус. пер. — Лирика. М., 1963; Стихотворения. Л., 1982.

Літ.: Дарян З.М. Саят-Нова: Роман. М., 1973.

А.Казінян.

СВАБО́ДА, магчымасць чалавека дзейнічаць у адпаведнасці са сваімі мэтамі, жаданнямі, інтарэсамі. Практычная рэалізацыя С. ажыццяўляецца пры наяўнасці аб'ектыўнай магчымасці (знешняй С.) для дзейнасці. У гісторыі грамадскай і філас. думкі С. разглядалася як праблема валодання чалавекам *свабодай волі* і абумоўленасці С. знешнімі абставінамі (гл. *Свабода і неабходнасць*). У ант. філасофіі С. процілстаўлялася лёсу (Сакрат, Платон), паліт. дэспатызму (Арыстоцель, Эпікур), чалавечаму існаванню (стаіцызм, платанізм). У сярэдневякоўі С. разумелася як збаўленне ад граху, спалучэнне ўнутр. маральнай С. з усемагутнасцю Бога. У эпоху Адраджэння яна разглядалася як магчы-

масць поўнага і бесперашкоднага развіцця асобы. У філасофіі Асветніцтва прызнавалася панаванне над С. натуральных заканамернасцей свету і прычынных сувязей паміж яго элементамі. У ням. філасофіі з 17 ст. С. разглядалася як маральна-творчае развіццё сутнасці чалавека (Г.Лейбніц, І.Кант, І.В.Гётэ, Ф.Шылер, А.Шапенгаўэр, Ф.Ніцшэ). Прадстаўнікі марксізму сцвярджалі, што С. чалавека дэтэрмінавана ўмовамі яго асяроддзя. У экзістэнцыялізме яна разумеецца як С. выбару самога сябе і звязваецца з адказнасцю за выбар (Ж.П.Сартр, М.Хайдэгер, К.Ясперс). Змест паняцця С. звязаны з гіст. працэсам развіцця грамадства. У стараж. грамадстве С. разумелася як прыналежнасць да пэўнага роду ці племені і супрацьпастаўлялася залежнасці ад інш. плямён. У індустрыяльным грамадстве яна набыла эканам. і юрыд. сэнс як магчымасць выбару прафес. дзейнасці, валодання ўласнасцю і яе стварэння. У постіндустрыяльным грамадстве характарызуецца здольнасцю чалавека да адаптацыі і сац. мабільнасці ў сацыякульт. і тэхнал.-інфарм. прасторы. Ступень С. ў грамадстве цесна звязана з формай праўлення. Перадумовамі С. ў дзяржаве з'яўляюцца канстытуцыяналізм, забеспячэнне гарантыі абароны правоў чалавека і задавальнення асн. патрэбнасцей яго жыцця, фарміраванне органаў дзярж. улады шляхам нар. волевыяўлення. *І.І.Катляр.*

СВАБО́ДА, амерыканская радыёстанцыя, засн. ў г. Мюнхен (ФРГ) у 1952, ва ўмовах «халоднай вайны», для вядзення інфармацыйна-прапагандысцкай барацьбы супраць СССР. Упершыню выйшла ў эфір у сак. 1953 як радыё «Вызваленне», неўзабаве перайменавана ў «С.» Фармальна выступала ад імя няўрадавай арг-цыі «Камітэт барацьбы за вызваленне ад бальшавізму» (з 1964 «Камітэт вызвалення»), але ў пач. 1970-х г. камісія Кангрэса ЗША афіц. прызнала факт яе фінансавання амер. спецслужбамі з дзярж. бюджэтных крыніц. У 1977 рэдакцыя «С.» пры фармальным захаванні самастойнасці аб'яднана ў адным будынку з рэдакцыяй радыёстанцыі «Свабодная Еўропа» (засн. ў 1950). Да канца 1980-х г. на радыёстанцыі «С.» карэспандэнтамі і каментатарамі працавалі пераважна эмігранты і перабежчыкі з СССР, у т.л. з Беларусі, кіруючыя пасады займалі кадравыя амер. спецыялісты. У складзе рэдакцыі «С.» былі арганізаваны адпаведныя нац. рэдакцыі (у т.л. з 1954 беларуская), якія вялі перадачы на 17 мовах народаў СССР. Асн. кірункамі радыёперадач «С.» ў гэты перыяд былі крытыка сацыялізму, сав. ладу і нац.-дзярж. ўпарадкавання СССР. У іх асвятляліся негатыўныя з'явы з гісторыі і сучаснага жыцця СССР (у т.л. парушэнні *правоў чалавека, рэпрэсіі палітычныя* ў СССР), паведамлялася пра падзеі і здарэнні, якія замоўчваліся ў сав. сродках масавай інфармацыі, пра *праваабарончы рух у СССР*, пра *дысідэнтаў*; чыталіся літ. творы А.Зіноўева, У.Максімава, Б.Пастарнака, А.Салжаніцына і інш., што былі забаронены ў СССР. Распад СССР і спыненне «халоднай вайны» не прывялі да закрыцця «С.». Яна ператварылася ў адзін з прапагандысцкіх інструментаў амер.-натаўскай палітыкі глабалізму. У 1995 штаб-кватэра «С.» пераехала з Мюнхена ў Прагу. Створаны новыя карэспандэнцкія пункты, у т.л. ў Беларусі, Расіі і інш. краінах б. СССР. Абнавіўся апарат «С.». У карэспандэнцкіх пунктах у краінах СНД штатнымі супрацоўнікамі пачалі працаваць журналісты, арыентаваныя на зах. ліберальна-дэмакр. каштоўнасці. Некат. б. супрацоўнікі «С.» (М.Дэйч, С.Шусцер, М.Сакалоў і інш.) цяпер працуюць у рас. сродках масавай інфармацыі. Бел. служба «С.» вяшчае 8 гадз у суткі і мае інфарм., аналітычныя праграмы па эканам., культуралагічных, этнагр., гіст., рэлігіязнаўчых, краязнаўчых і інш. праблемах. Сярод былых і сучасных супрацоўнікаў бел. рэдакцыі «С.» С.Станкевіч, Я.Запруднік, Г.Айзенштат, В.Жданко, Ю.Дракахруст, А.Лукашук, С.Навумчык і інш. «С.» прапагандуе прынцыпы зах. дэмакратыі, ліберальнай эканомікі і з гэтых пазіцый асвятляе падзеі ў свеце, выступае супраць аднаўлення геапаліт. адзінства б. рэспублік СССР.

Літ.: Вачнадзе Г.Н. Антенны направлены на Восток. 2 изд. М., 1977. *В.І.Боўш.*

«СВАБО́ДА», грамадска-палітычная газета. Выдавалася ў 1990—97 у Мінску на бел. мове 3 разы на тыдзень. Рэдакцыя «С.» лічыла сваё выданне пераемніцай аднайм. газеты, адзіны нумар якой у 1902 падрыхтавалі В.Іваноўскі, В.Валейка, Р.Мілер і А.Пашкевіч (Цётка). Асвятляла пытанні грамадска-паліт., эканам., культ. і духоўнага жыцця Беларусі, знаёміла чытачоў з міжнар. падзеямі. Друкавала матэрыялы па гісторыі Беларусі. *В.В.Грынявецкі.*

СВАБО́ДА ВЕРАВЫЗНА́ННЯ, адна з асн. асабістых свабод чалавека, якая ўключае права індывідуальна або сумесна з інш. вызнаваць любую рэлігію, свабодна выбіраць, мець і распаўсюджваць рэлігійныя перакананні і дзейнічаць у адпаведнасці з імі. С.в. прызнаецца канстытуцыямі нават тых краін, дзе існуе інстытут дзярж. (афіц.) рэлігіі. У Рэспубліцы Беларусь гарантуецца арт. 31 Канстытуцыі.

СВАБО́ДА ВО́ЛІ, філасофска-этычнае паняцце, якое азначае самавызначальнасць чалавека ў сваіх дзеяннях. У філасофіі цесна звязана з праблемамі *дэтэрмінізму* і *індэтэрмінізму* волі чалавека, у этыцы — з пытаннямі аб адказнасці чалавека за свае дзеянні, аб суадносінах С.в. і маралі; у хрысц. філасофіі і этыцы разглядаецца ў кантэксце праблемы Божага прадвызначэння і свабоды выбару асобы. Праблеме С.в. належыць адно з цэнтр. месцаў у гісторыі філас. і этычнай думкі. Сакрат падкрэсліваў вызначальную ролю пазнання ў ажыццяўленні С.в. Платон звязваў С.в. з арыентацыяй на ўсеагульны ідэал дабра, Арыстоцель — з праблемай маральнага выбару. Для сярэдневяковай філасофіі характэрны ідэі прадвызначэння і прэваліравання Божай усемагутнасці над асабістай С.в. чалавека (Аўгусцін, І.Дунс Скот, Фама Аквінскі) або прызнання С.в. асобы як магчымасці выбару паміж дабром і злом (Пелагій). У антрапацэнтрычнай філасофіі Адраджэння С.в. разглядалася як аснова чалавечай дабрадзейнасці, поўнага прыроднага і культ. самаразвіцця асобы (Л.Вала, К.Салютаці, Дж.Манеці). Бел. філасофія Адраджэння прасякнута ідэямі С.в., якая набліжае чалавека да вобраза Бога (С.Будны, Л.Зізаній), з'яўляецца асновай самаўдасканалення асобы шляхам падпарадкавання эмоцый і памкненняў розуму (Б.Будны, А.Алізароўскі), творчага самавыяўлення (М.К.Сарбеўскі). З 17 ст. ў вырашэнні праблемы С.в. вызначыліся 2 супрацьлеглыя пазіцыі: дэтэрмінізм, які сцвярджае, што воля абумоўлена знешнімі прычынамі і адмаўляе існаванне С.в. (Т.Гобс, Б.Спіноза), і індэтэрмінізм, які адстойвае ідэю самаабумоўленасці волі і абсалютнай С.в. (І.Фіхтэ). І.Кант аб'яднаў дэтэрмінізм і індэтэрмінізм, сцвярджаючы, што чалавек абсалютна несвабодны ў прыродным асяроддзі і валодае С.в. толькі ў інтэлігібельным (розумаспасцігальным) свеце. Г.Гегель лічыў С.в. атрыбутам сусв. духу, А.Шапенгаўэр разглядаў С.в. чалавека як выяўленне сусв. С.в. і крыніцу адвечных пакут, звязаных з бясконцасцю чалавечых жаданняў. Рацыяналістычную трактоўку С.в. прапанавалі К.Маркс і Ф.Энгельс, якія лічылі, што пазнанне і засваенне навакольнага асяроддзя спрыяюць ажыццяўленню С.в. Ірацыянальнай трактоўкі С.в. прытрымліваліся С.К'еркегор, Г.Маркузе, К.Ясперс, якія сцвярджалі, што веды і рацыяналізм звужаюць магчымасці для выяўлення С.в. Э.Фром вызначыў парадаксальную адметнасць чалавека 20 ст. — «уцёкі» ад С.в. як форму самаабароны ад непакою, звязанага з адзінотай, адказнасцю за выбар і нявызначанасцю будучыні. У экзістэнцыялізме і фенаменалогіі С.в. разглядаецца як неад'емны атрыбут асобы, які выводзіць яе па-за межы матэрыяльнага свету (М.Хайдэгер, Ж.П.Сартр). Гл. таксама *Воля, Свабода, Свабода і неабходнасць.*

Літ.: Ноговицин О.М. Ступени свободы: Логико-ист. анализ категории свободы. Л., 1990; Максимов А.М. Измерения свободы. Екатеринбург, 1994; Калмыков Р.Б. Анатомия свободы. Иваново, 1995; Валла Л. Об истинном и ложном благе; О свободе воли: Пер. с лат. М., 1989; Шопенгауэр А. Свобода воли и нравственность: Пер. с нем. М., 1992; Виндельбанд В. О свободе воли: Пер. с нем. Мн.; М., 2000; Левин Г.Д. Свобода воли: Современ. взгляд // Вопр. философии. 2000. № 6. *Н.Г.Кісялёва.*

СВАБО́ДА І НЕАБХО́ДНАСЦЬ, філасофскія катэгорыі, якія вызначаюць узаемадзеянне паміж дзейнасцю людзей і аб'ектыўнымі законамі прыроды і грамадства. Характарызуюць здольнасць чалавека дзейнічаць у адпаведнасці са сваімі ведамі, інтарэсамі і мэтамі з улікам унутр. і ўстойлівых узаемасувязей і адносін аб'ектыўнай рэальнасці. Прадстаўнікі ідэалістычнай філасофіі разглядаюць С. і н. як узаемавыключальныя паняцці, разумеюць *свабоду* як *свабоду волі*, самавызначэнне духу, недэтэрмінаваныя знешнімі ўмовамі, аснову чалавечай адказнасці. Прадстаўнікі механіст. дэтэрмінізму адмаўляюць свабоду волі і сцвярджаюць, што дзеянні чалавека вызначаюцца знешнімі, незалежнымі ад яго абставінамі. Б.Спіноза разумеў свабоду як усвядомленую неабходнасць. Г.Гегель распрацаваў канцэпцыю дыялект. адзінства С. і н. Дыялектычна-матэрыяліст. асэнсаванне праблемы С. і н. зыходзіць з прызнання першаснасці аб'ектыўнай неабходнасці і другаснасці свабоды і свядомасці чалавека як вытворных ад неабходнасці. У паўсядзённай практыцы людзі сутыкаюцца з выяўленнем неабходнасці ў форме ўмоў жыцця, сац.-эканам. адносін, наяўных матэрыяльна-тэхн. сродкаў. Непазнаныя законы развіцця прыроды і грамадства з'яўляюцца неўсвядомленай неабходнасцю. У працэсе развіцця соцыуму межы неўсвядомленай неабходнасці звужаюцца, а свабода асобы як усвядомленая неабходнасць узрастае ў межах дзеяння аб'ектыўных законаў развіцця прыроды і грамадства.

І.В.Катляроў.

СВАБО́ДА МАНІФЕСТА́ЦЫЙ, магчымасць праводзіць *дэманстрацыі*, *мітынгі*, сходы, вулічныя шэсці і пікетаванне; адна з асноўных канстытуцыйных паліт. свабод грамадзян. С.м., якія не парушаюць правапарадак і правы інш. грамадзян, гарантуецца дзяржавай. У дэмакр. краінах аб *маніфестацыях*, апрача простых пікетаў, звычайна загадзя паведамляюць. Улады могуць забараніць маніфестацыі ў месцах, якія маюць важнае значэнне для нармальнага функцыянавання гар. транспарту. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб С.м. — Канстытуцыя (арт. 35) і Закон «Аб сходах, мітынгах, вулічных шэсцях, дэманстрацыях і пікетаванні» ад 30.12.1997. Забараняецца правядзенне маніфестацый, калі іх мэтай з'яўляецца гвалтоўная змена канстытуцыйнага ладу ці прапаганда вайны, сац., нац., рэліг. або расавай варожасці. Мясц. выканаўчыя і распарадчыя органы могуць дадаткова рэгламентаваць парадак правядзення маніфестацый з улікам мясц. умоў.

Г.А.Маслыка.

СВАБО́ДА ПАЛІТЫ́ЧНАЯ, у паліталогіі натуральная, неадчужальная ад чалавека і сац. супольнасцей людзей якасць, якая дазваляе ім выказваць свае думкі і дзейнічаць у адпаведнасці з прававымі нормамі і інтарэсамі накіраванасці на стабілізацыю, парадак у палітыка-ўладных адносінах дзяржавы і грамадства. Складаюць неад'емную частку міжнар. прызнаных *правоў чалавека*. С.п. замацаваны ў канстытуцыях, інш. законах і прававых нормах дэмакр. дзяржаў. У *Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь* замацаваны свабода поглядаў, перакананняў і іх выказвання; права на свабоду сходаў, мітынгаў, вулічных дэманстрацый і пікетавання; права на ўдзел у вырашэнні дзярж. спраў як непасрэдна, так і праз сваіх прадстаўнікоў і г.д. (гл. *Канстытуцыйныя правы, свабоды і абавязкі грамадзян Рэспублікі Беларусь*). Адной з гал. умоў практычнага ажыццяўлення С.п. з'яўляецца фарміраванне ў кожнага чалавека культуры свабоды, г. зн. культуры паліт. выбару, культуры кампрамісу, разумення магчымасці і правамернасці канкрэтна-ўсвядомленых дзеянняў у той ці інш. сітуацыі.

СВАБО́ДА СЛО́ВА, адно з асн. асабістых правоў чалавека і паліт. правоў грамадзян, састаўная частка больш агульнага права, якое атрымала назву «свабода інфармацыі». Уяўляе сабой магчымасць публічна (вусна, у пісьмовай форме, з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі) выказваць сваё меркаванне (думкі). Заканадаўства і суд. практыка ў дэмакр. краінах выпрацавалі сістэму абмежаванняў С.с. і карыстання інфармацыяй з мэтай не дапускаць злоўжывання імі і абароны гонару і годнасці грамадзян. Забараняецца выкарыстанне С.с. для заклікаў да гвалтоўнага звяржэння законнай дзярж. улады, выдавання дзярж. і інш. тайнаў, якія ахоўваюцца законам, для падбухторвання да ўчынення злачынстваў, для распальвання нац., расавай, рэліг. і інш. варожасці, абраз і паклёпаў на інш. асоб, пасяганне на грамадскую мараль. Пералік абмежаванняў на С.с. можа быць пашыраны ў перыяд дзеяння рэжымаў надзвычайнага і ваен. становішча. У Рэспубліцы Беларусь С.с. і права на атрыманне і распаўсюджванне інфармацыі замацаваны ў арт. 34 Канстытуцыі. Манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі дзяржавай, грамадскімі аб'яднаннямі або асобнымі грамадзянамі, а таксама цэнзура не дапускаюцца. Гл. таксама *Галоснасць*, *Інфармацыя*.

І.І.Катляр.

СВАБО́ДА ТВО́РЧАСЦІ, неад'емнае права чалавека і грамадзяніна на навуковую, тэхнічную, літаратурна-мастацкую і інш. віды творчасці, а таксама свабоду выкладання. Пачала замацоўвацца ў канстытуцыях розных краін адносна нядаўна. У Рэспубліцы Беларусь гарантуецца п. 2 арт.. 51 Канстытуцыі. С.т. азначае магчымасць свабодна займацца рознымі відамі творчасці, выяўляць і рэалізоўваць свае здольнасці і веды, а таксама вольна прымаць рашэнні пра абнародаванне, укараненне і выкарыстанне вынікаў творчай дзейнасці. Канстытуцыйныя гарантыі рэалізацыі С.т. прадугледжваюць не толькі прадастаўленне свабоды займацца пэўным відам творчасці (магчымасць праводзіць навук. даследаванні, рабіць адкрыцці і вынаходствы, ствараць духоўныя каштоўнасці), але і абавязваюць дзяржаву забяспечваць яе рэалізацыю: устанаўленне прававых асноў ажыццяўлення творчай дзейнасці, стварэнне ўмоў для назапашвання ведаў і іх пашырэння, ахова інтэлектуальнай і маст. уласнасці, матэрыяльная падтрымка творчых грамадскіх аб'яднанняў, суд. абарона права на С.т. С.т. мае ўсеагульны характар: яна належыць не толькі асобам творчых прафесій, але і ўсім грамадзянам. Паводле гэтага права грамадзяне могуць патрабаваць ад дзяржавы і грамадскіх арг-цый устаранення любых перашкод, якія замінаюць іх творчай працы. Важнай гарантыяй С.т. з'яўляецца абарона дзяржавай правоў аўтараў, вынаходнікаў і рацыяналізатараў (гл. *Аўтарскае права*, *Вынаходніцкае права*).

Г.А.Маслыка.

СВАБО́ДНА КАНВЕРСО́ЎНАЯ ВАЛЮ́ТА (СКВ), *валюта*, якая свабодна абменьваецца на інш. замежныя валюты і міжнар. плацежныя сродкі і якой можа карыстацца кожны трымальнік пры разліках па гандл., крэдытных, інвестыцыйных і інш. міжнар. аперацыях без абмежаванняў. СКВ (іншы раз наз. цвёрдай валютай) валодае поўнай знешняй і ўнутр. абарачальнасцю, г. зн. аднолькавым рэжымам абмену і для *рэзідэнтаў*, і для нерэзідэнтаў. Гл. *Канверсоўнасць валюты*.

У.Р.Залатагораў.

«СВАБО́ДНАЯ ГЕРМА́НІЯ», гл. ў арт. *Нацыянальны камітэт «Свабодная Германія»*.

«СВАБО́ДНАЯ ФРА́НЦЫЯ», гл. ў арт. *«Змагарная Францыя»*.

СВАБО́ДНАЯ ЭКАНАМІ́ЧНАЯ ЗО́НА, тэрыторыя ў межах якой-н. дзяржавы, дзе ўстанаўліваюцца пэўныя льготныя ўмовы (прэферэнцыі) гасп. і прадпрымальніцкай дзейнасці мытнага, валютнага, падатковага, візавага характару. Задачы С.э.з.: стымуляванне ў зоне дзейнасці, звязанай з апрацоўкай тавараў, што павялічвае іх вартасць, рост экспарту; прыцягненне замежных інвестыцый і новых тэхналогій; стварэнне ўмоў для выхаду нац. кампаній і фірм на знешнія рынкі; паскарэнне эканам. развіцця краіны. Іх вырашэнне дасягаецца праз стварэнне за кошт дзярж. інвестыцый вытв. інфраструктуры, адмены мытных пошлін і падаткаабкладання экспарту, вызвалення або змяншэння падаткаў на даходы прадпрыемстваў і фірм зоны, ільготнага перамяшчэння даходаў замежных інвестараў за межы краіны, надання права набыцця ўчасткаў зямлі на тэр. зоны па льготных стаўках, ільготнага крэдытавання для будаўніцтва вытв. пабудоў і інш. Больш як 40-гадовая сусв. практыка сведчыць, што ў сваім развіцці С.э.з. праходзяць 3 асн. этапы. На першым ствараецца вытв. і абслуговая інфраструктура, аддаецца перавага прадпрыемствам, якія забяспечваюць хуткае абарачэнне капіта-

лу ў гандлі, сельскай гаспадарцы, сферы паслуг. Другі этап характарызуецца ростам прамысл. прадпрыемстваў у спалучэнні са знешнім гандлем. На наступным этапе ажыццяўляецца пераход ад працаёмкіх працэсаў вытв-сці да перавагі тэхналогій перадавых галін.

Найб. пашырэнне атрымалі экспартна-вытворчыя і імпартна-вытворчыя С.э.з., бязмытныя зоны або зоны свабоднага гандлю (порты, аэрапорты), спецыялізаваныя зоны навук.-тэхн. развіцця, зоны страхавых і банкаўскіх паслуг. У свеце дзейнічае каля 480 С.э.з. розных спецыялізацый.

На Беларусі С.э.з. ствараюцца з 1990-х г. Іх дзейнасць рэгулюецца заканадаўствам. Нарматыўна-прававая база закладзена ў 1996 Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб свабодных эканам. зонах на тэр. рэспублікі. На 1.1.2001 на Беларусі функцыянуюць 4 С.э.з.: «Брэст», «Мінск», «Гомель-Ратон», «Віцебск», зарэгістравана 169 прадпрыемстваў-рэзідэнтаў. Фактычна працуюць 144 прадпрыемствы-рэзідэнты (85,2%), з іх 50% знаходзіцца ў Брэсцкай зоне, большасць рабочых месц (52,6%) прыпадае на Гомельскую зону. Прамыя замежныя інвестыцыі ў 2000 на ўсе зоны склалі 6896,7 млн. руб. Асн. галіны вытв-сці ў бел. С.э.з. — прадпрыемствы электратэхн., лясной, дрэваапр. і цэлюлознапаперовай, харч. прам-сці. Аб'ём прадукцыі, выпушчанай прадпрыемствамі-рэзідэнтамі ўсіх зон, склаў менш за 1% ад агульнай па рэспубліцы. Гэта сведчыць, што С.э.з. істотнага ўплыву на эканоміку краіны пакуль што не робяць.

Літ.: Данько Т.П., Окрут З.М. Свободные экономические зоны в мировом хозяйстве. М., 1998; Абрамчук С.Н. Свободные экономические зоны в Республике Беларусь: пробл. и перспективы развития. Брест, 1999. *В.С.Булко.*

СВАБО́ДНАЯ ЭНЕ́РГІЯ, адзін з *патэнцыялаў тэрмадынамічных*; тое, што ізахорна-ізатэрмічны патэнцыял (энергія Гельмгольца). Выражаецца як рознасць паміж *унутранай энергіяй U* тэрмадынамічнай сістэмы і здабыткам *энтрапіі S* на абсалютную т-ру *T* (звязанай энергіяй): $F = U - TS$.

СВАБО́ДНЫ ВЕРШ, верлібр (франц. vers libre), дысметрычны верш, рытм якога ўтвараецца чаргаваннем вершаваных радкоў аднатыпнай інтанацыйна-сінтакс. структуры. Рытмічная мернасць размяшчэння радкоў падкрэсліваецца паўзамі, паўторам стылістычных фігур, аднолькавых слоў ці іх форм, асобных радкоў. У С.в. адсутнічае адзіная скразная мера паўтораў, яна ўвесь час мяняецца, захоўваючы інтанацыйна-сэнсавае і стылявое адзінства верша:

Ты бачыш. Чаму ж я не бачу?
Я чую. Чаму ж ты не чуеш?
Мне весела. А табе сумна?
Мне горка. А табе соладка?
Якой жа мы ніткаю сшыты,
Што і маладымі зубамі
Ніяк яе не перакусім.

(*М.Танк.* «Ты бачыш. Чаму ж я не бачу?»)

С.в. узнік у амер. і еўрап. л-рах у сярэдзіне 19 ст. (У.Уітмен, У.Блейк, Г.Гейнэ), сустракаўся ў класічнай рус. паэзіі (А.Фет, Я.Полонскі). Тэрмін «верлібр» увёў ва ўжытак франц. пісьменнік Г.Кан у 1884. Вял. пашырэнне атрымаў у 20 ст. (А.Блок, В.Брусаў, У.Маякоўскі, у замежнай л-ры П.Нэруда, Назым Хікмет Ран і інш.).

У бел. паэзіі С.в. увёў М.Багдановіч («Двайняткі», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы»; пераклад верша Э.Верхарна «Паўстанне»). Пашыраны ў сучаснай бел. паэзіі (Р.Барадулін, А.Вярцінскі, А.Грачанікаў, С.Дзяргай, В.Зуёнак, А.Лойка, П.Макаль, Н.Мацяш, А.Наўроцкі, П.Панчанка, А.Разанаў, Я.Сіпакоў, М.Танк). У большасці вершы, напісаныя С.в., адносяцца да філасофскай ці медытатыўнай лірыкі.

А.А.Майсейчык.

«СВАБО́ДНЫЯ АФІЦЭ́РЫ», тайная афіцэрская арг-цыя ў Егіпце ў 1940-я — пач. 1950-х г. Яе ядро (Г.А.*Насэр*, М.А.*Садат* і інш.) узнікла ў 1942, арганізацыйна аформілася ў 1949. Да 1952 налічвала каля 1 тыс. членаў, якія займалі розныя пасады ва ўсіх звёнах ваен. і дзярж. кіраўніцтва Егіпта. Ставіла за мэту ажыццяўленне шырокіх сац., паліт. і эканам. рэформ, незалежнай знешняй палітыкі краіны. 23.7.1952 узначаліла ваен. пераварот, які адхіліў ад улады караля Фарука, пасля чаго выканком «С.а.» ператвораны ў Савет кіраўніцтва рэвалюцыяй (старшыня М.Нагіб), які ўзяў на сябе ўсю ўладу ў краіне.

СВАБО́ДНЫЯ ВАГА́ННІ, уласныя ваганні, від *ваганняў*, якія адбываюцца ў фіз. сістэме без знешняга ўздзеяння за кошт першапачаткова нададзенай энергіі (патэнцыяльнай ці кінетычнай). Характар С.в. вызначаецца ўласнымі параметрамі сістэмы (масай, індуктыўнасцю, эл. ёмістасцю, пругкасцю і інш.). У рэальных сістэмах С.в. затухальныя з-за рассеяння энергіі, а пры вялікіх яе стратах — аперыядычныя. У *лінейных сістэмах* С.в. — суперпазіцыя *нармальных ваганняў*.

СВАДЭ́ШЫ (санскр. — свая вытворчасць), адна з форм нац.-вызв. барацьбы ў Індыі ў канцы 19 — пач. 20 ст. Узнікла як барацьба ў абарону мясц. вытворчасці, што цярпела з-за канкурэнцыі англ. тавараў; асноўная яе форма — адмова набываць англ. тавары. У 1906 лозунг С. быў высунуты *Індыйскім нацыянальным кангрэсам* як яго праграмнае патрабаванне. Найб. ўздым кампанія С. набыла ў 1905—08, лозунг С. часта выкарыстоўваў М.К.*Гандзі* ў ходзе кампаній *сат'ягрэхі* ў 1920—30-я г.

СВА́ЗІЛЕНД (свазі Swatini, англ. Swaziland), Каралеўства Свазіленд (свазі Umbuso we Swatini, англ. Kingdom of Swaziland), дзяржава ва ўнутр. частцы Паўд. Афрыкі. Мяжуе на Пн, З і Пд з Паўд.-Афр. Рэспублікай (ПАР), на У — з Мазамбікам. Пл. 17,4 тыс. км². Нас. 1083,3 тыс. чал. (2000). Дзярж. мовы свазі і англійская. Сталіца — г. *Мбабане*, рэзідэнцыя караля і парламента — г. Лобамба. Краіна падзяляецца на 4 раёны. Нац. свята — Дзень незалежнасці (6 вер.).

Герб і сцяг **Свазіленда**.

Дзяржаўны лад. С. — канстытуцыйная манархія. Чл. Садружнасці. Дзейнічае канстытуцыя 1978. Кіраўнік дзяржавы — кароль, які ўзначальвае заканад. і выканаўчую ўлады. Вышэйшы заканад. орган краіны — двухпалатны парламент (лібандла), які складаецца з Нац. сходу (65 месц) і Сената (30 месц). Тэрмін дзейнасці парламента 5 гадоў. Выбары ў Нац. сход — двухступенныя (у 2-м туры 55 дэпутатаў выбіраюцца выбаршчыкамі, 10 назначаюцца каралём). 10 сенатараў выбіраюцца палатай сходу, 20 — назначаюцца каралём. Урад фарміруецца каралём.

Прырода. Паверхня — плато, якое паніжаецца на У да ўзбярэжжа Індыйскага ак. З прыступкамі шырынёй ад 20 да 80 км: Высокі Велд (выш. 1500—1000 м), Сярэдні Велд (800—400 м) і Нізкі Велд (300—150 м). Найвыш. пункт — г. Эмлембе (1862 м). На крайнім У горы Лебомба (выш. да 770 м). Ёсць радовішчы азбесту, жал. руды, каменнага вугалю і інш. Клімат субтрапічны. Сярэднія т-ры ліп. ад 12 °С на Высокім Велдзе да 15 °С на Нізкім, лют. ад 23 да 25 °С. Ападкаў за год ад 500—700 мм на Нізкім Велдзе да 1400 мм на Высокім; выпадаюць пераважна летам. Рэкі горныя. Пераважае саванная расліннасць з акацыямі і баабабамі, на У — ксерафітныя хмызнякі. Пад лесам менш за 7% тэр., на схілах узгоркаў на Высокім Велдзе — хваёвыя лясы. Праводзяцца лесапасадкі. Жывёльны свет тыповы для саваннаў. З млекакормячых сустракаюцца буйвалы, антылопы, зебры, бегемоты. На У распаўсюджана муха цэцэ. Ёсць некалькі рэзерватаў.

Насельніцтва. Афрыканцы складаюць 97% насельніцтва, у т.л. народы свазі — больш за 80% і зулу — каля 13%; 3% — англічане, афрыканеры, выхадцы з Індыі і Пакістана. Сярод вернікаў 60% хрысціян (пераважна католікі), 40% захоўваюць мясц. традыц. вераванні. Сярэднегадавы прырост 1,9% (1999). Сярэдняя шчыльн. насельніцтва 62 чал. на 1 км^2, больш шчыльна (да 200 чал. на 1 км^2) заселены Сярэдні Велд. Гар. насельніцтва 26%. У г. Мбабане 47 тыс. ж. (2000), у астатніх гарадах каля 10 тыс. ж. У сельскай гаспадарцы занята 60% працаздольнага насельніцтва, у прам-сці — 10%, у абслуговых галінах — 30%. Значная ч. (да 30%) мужчынскага насельніцтва працуе ў ПАР (сезонна або пастаянна).

Гісторыя. Плямёны свазі засялілі тэр. С. ў канцы 18 ст. У 1820—30-я г. іх правадыр Сабхуза I стварыў цэнтралізаваную дзяржаву свазі, якая ў сярэдзіне 19 ст. дасягнула пэўнага росквіту пры яго пераемніку Мсваці I. У 1894 яна далучана да *Трансвааля*. Пасля *англа-бурскай вайны 1899—1902* у 1903 створаны асобны брыт. пратэктарат С. З 1964 краіна атрымала самакіраванне, 6.9.1968 абвешчана незалежнасць Каралеўства С. Паводле канстытуцыі 1968 усталяваны рэжым парламенцкай манархіі. Пасля парламенцкіх выбараў 1973, на якіх поспех мела апазіцыя, кароль Сабхуза II [1921—82] скасаваў канстытуцыю, распусціў парламент і забараніў палітычныя партыі. Новая канстытуцыя 1979 сканцэнтравала дзярж. ўладу ў руках караля, абмежавала паўнамоцтвы парламента і забараніла дзейнасць партый.

У 1990-я г. актывізавалася дзейнасць дэмакр. апазіцыі, арганізаваныя ёю нар. выступленні прымусілі караля Мсваці III [з 1982] ажыццявіць пэўную дэмакратызацыю паліт. жыцця. С. — чл. ААН (з 1968), Арг-цыі афр. адзінства.

Гаспадарка. С. — эканамічна слаборазвітая агр. краіна з вял. уплывам замежнага (пераважна паўд.-афр.) капіталу. Кіраўніцтва краіны праводзіць курс на стварэнне спрыяльных умоў для прыцягнення замежных інвестыцый. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) — 4 млрд. дол. (1998), па 4,2 тыс. дол. на 1 чал. У прам-сці ствараецца 42% ВУП, у сельскай гаспадарцы 10%, у абслуговых галінах — 48%. Аснова эканомікі — сельская гаспадарка. Пад ворывам і шматгадовымі насаджэннямі каля 200 тыс. га, пад пашай каля 1,1 млн. га. Арашаецца каля 70 тыс. га зямлі. Вылучаюцца афр. і еўрап. сектары. Афрыканцы пераважна вядуць паўнатуральнае матычнае земляробства, памер іх гаспадарак каля 1 га, вырошчваюць кукурузу, сорга, пшаніцу, бабовыя, агародніну. Таварная экспартная прадукцыя вырошчваецца на плантацыях і буйных фермах: цукр. трыснёг (каля 500 тыс. т цукру штогод), бавоўнік, тытунь, рыс, цытрусавыя і ананасы. Жывёлагадоўля адгонна-пашавая. Пагалоўе (тыс. галоў, 1997): буйн. раг. жывёлы 652, коз 439. Асн. раёны жывёлагадоўлі Высокі і Сярэдні Велд. Птушкагадоўля (у 1997 — 980 тыс. курэй). У прам-сці пераважаюць дробныя прадпрыемствы па перапрацоўцы с.-г. сыравіны (цукр., безалкагольных напіткаў, малочныя, мясныя, мукамольныя, алейныя і інш.), дрэваапрацоўчыя, тэкст., швейныя, хімічныя. У г. Мбабане — металаапр. прадпрыемствы, у г. Манзіні — зборка тэлевізараў з імпартаваных частак. Лесанарыхтоўкі. Пашыраны саматужная і паўсаматужная апрацоўка скур, вытв-сць тканін, адзення і абутку, ганчарных вырабаў, драўляных прадметаў хатняга побыту, сувеніраў. Вытв-сць электраэнергіі 420 млн. кВт · гадз (1998), у т. л. 50,6% на ГЭС, 49,4% на цеплавых электрастанцыях, імпартавана з ПАР 571 млн. кВт · гадз. Здабыча азбесту (у асобныя гады 4-е месца ў свеце), жал. руды, каменнага вугалю. Транспарт пераважна аўтамабільны і чыгуначны. У С. 3,8 тыс. км аўтадарог, 297 км чыгункі. Для знешнегандл. зносін вял. значэнне маюць парты Дурбан (ПАР) і Мапуту (Мазамбік). У краіне 18 аэрапортаў і пасадачных пляцовак, у т.л. міжнар. аэрапорт каля г. Манзіні. У 1998 экспарт склаў 972 млн. дол., імпарт — 1,2 млрд. дол. У экспарце пераважаюць цукар (40% па кошце), азбест, канцэнтраты безалкагольных напіткаў, драўніна, бавоўна, фрукты; у імпарце — прамысл. і спажывецкія тавары, збожжа, паліва, хімікаты. Асн. гандл. партнёры: ПАР (58% экспарту, 96% імпарту), краіны Еўропы, Японія. Турызм (каля 250 тыс. чал. штогод пераважна з ПАР, даход каля 40 млн. дол.). Важнае эканам. значэнне маюць грашовыя пераводы грамадзян С. з-за мяжы. С. атрымлівае эканам. дапамогу ад ПАР і Вялікабрытаніі. Грашовая адзінка — ліланген.

І.Я.Афнагель (прырода, насельніцтва, гаспадарка).

СВАЙГІ́НСКАЯ ГРАДА́ (ОЗ), геамарфалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1988). Размешчана паміж вёскамі Свайгіні і Замэчак Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. Тыповая форма ледавіковага рэльефу, озавая града даўж. 4 км, шыр. 100 м, выш. да 20 м, пл. 0,4 км^2, выцягнута з Пн на Пд. Складзена пераважна з пяску, жвіру, марэннага супеску і дробных валуноў. Утварылася каля 20—17 тыс. г. назад у выніку намнажэння флювіягляцыяльных адкладаў у вузкай шчыліне ледавіка.

В.Ф.Вінакураў.

СВА́ЛЬБАРД (Svalbard), нарвежская назва архіпелага *Шпіцберген*.

СВАН (Svan) Гундэ Андэрс (н. 1962), шведскі спартсмен (лыжы). Чэмпіён XIV зімовых Алімп. гульняў 1984 (г. Сараева, Югаславія) у гонцы на 15 км і эстафеце 4 × 10 км, XV зімовых Алімп гульняў 1988 (г. Калгары, Канада) у гонцы на 50 км і эстафеце 4 × 10 км. Прызёр Алімп. гульняў 1984 у гонцы на 50 км (серабро) і на 30 км (бронза). 7-разовы чэмпіён свету (1985—91).

«СВАП» (ад англ. swap абмен), камерцыйная аперацыя, якая спалучае наяўную куплю (продаж) з адначасовым заключэннем контрздзелкі на пэўны тэрмін. Існуе некалькі відаў аперацый С.: валютныя, працэнтныя, пазыковыя, з золатам і іх розныя спалучэнні.

СВАПО, гл. *Народная арганізацыя Паўднёва-Заходняй Афрыкі*.

СВАРА́ДЖ (санскр. літар. — сваё кіраванне), праграмны паліт. лозунг нац.-вызв. руху Індыі 1-й пал. 20 ст. Дасягненне С. абвешчана ў 1906 канчатковай мэтай *Індыйскага нацыянальнага кангрэса* (ІНК). Памяркоўныя кангрэсісты разумелі яго як самакіраванне Індыі ў складзе Брыт. імперыі, радыкалы — як поўную незалежнасць краіны. Пункт гледжання апошніх быў ухвалены на сесіі ІНК у Лахоры (1929) у выглядзе лозунга «пурна С.» (поўнага С.), што было дасягнута ў выніку заваявання Індыяй незалежнасці ў 1947.

СВАРАМІ́Р, вялікі князь ВКЛ, гл. *Шварн*.

СВАРО́Г (ад санскр. сварга — неба), вобраз стараж. міфалогіі ўсх. славян, божаства неба, нябеснага агню, бацька *Сварожыча* і *Дажбога*. Паводле стараж. міфа, злучыў неба і зямлю, навучыў людзей каваць жалеза (у час яго ўладарства нібыта з неба на зямлю ўпалі клешчы і людзі пачалі каваць зброю). Яму прыпісваецца ўвядзенне манагамнага шлюбу і кары за парушэнне гэтага звычаю (парушальнікаў быццам бы кідаў у вогненную печ). Паступова С. страціў значэнне гал. божаства, ім стаў Дажбог, потым *Пярун*. З пашырэннем хрысціянства рысы С. як апекуна шлюбу нададзены Кузьме.

М.Ф.Піліпенка.

СВАРО́ЖЫЧ, вобраз стараж. міфалогіі ўсх. славян, божаства зямнога агню, сын *Сварога*. Яму пакланяліся, да яго звярталіся з малітвай (найчасцей гэта рабілі каля ёўні). У час сушкі снапоў у ёўні спальвалі неабмалочаны сноп жыта як ахвяру С. Прымхлівыя людзі лічылі, што С. можа адвесці бяду. З пашырэннем хрысціянства імя С. паступова

знікла, але сляды культу захоўваліся да канца 19 ст. *М.Ф.Піліпенка.*

СВАРО́ТВА, рака ў Навагрудскім і Баранавіцкім р-нах Брэсцкай вобл., правы прыток р. *Моўчадзь* (бас. р. Нёман). Даўж. 35 км. Пл. вадазбору 150 км². Пачынаецца з воз. Свіцязь у Навагрудскім р-не, цячэ ў межах Навагрудскага ўзв., упадае ў р. Моўчадзь на Пн ад в. Моўчадзь Баранавіцкага р-на. Даліна трапецападобная, шыр. 1—1,5 км, у верхнім цячэнні 400—800 м. Пойма двухбаковая (шыр. 100—500 м), у сярэднім цячэнні забалочаная, у вытокавай частцы пад лесам. Рэчышча на працягу 9,1 км каналізаванае.

СВА́СТЫКА (санскр.), знак у выглядзе крыжа з загнутымі пад прамым вуглом канцамі. Першапачаткова меў культавае значэнне ў некат. стараж. народаў; атрымаў распаўсюджанне як арнаментальны матыў у мастацтве Індыі, Кітая, Японіі, Грэцыі, на в-ве Сіцылія і інш. (выявы С. на стараж. вазах, манетах, помніках сярэдневяковага мастацтва). Некат. гаршкі 11—13 ст., знойдзеныя пры раскопках стараж. гарадоў Беларусі, мелі на донцах рэльефнае кляймо ў выглядзе С. Напярэдадні і ў час 2-й сусв. вайны (1939—1945) С. выкарыстоўвалася як цэнтр. элемент кампазіцыі дзярж. сцяга фаш. Германіі, стала эмблемай нацызму, сімвалам варварства, насілля, генацыду.

СВАТ, 1) адзін з галоўных вясельных чыноў з боку жаніха — жанаты мужчына старэйшага ўзросту, які ўдзельнічаў у *сватанні* нявесты. 2) Жанаты ўдзельнік вяселля (дзядзька, брат, муж сястры, блізкі знаёмы жаніха або нявесты, сусед). 3) Бацька жаніха, іншы старэйшы жанаты сваяк нявесты ў адносінах найперш адзін да аднаго, а таксама да іншых родзічаў (і інш. удзельнікаў вяселля) з процілеглага боку, звычайна пасля дасягнення бакамі дамоўленасці пра шлюб. Старшы С. (першы, дружко, староста, маршалак) кіраваў вясельным працэсам у доме жаніха і ў доме нявесты, вёз жаніха ў дом маладой, дзяліў каравай і г.д. Гал. атрыбуты першага С.: ручнік праз плячо або 2 ручнікі накрыж, яркі пояс, пуга (палка) ці бізун з чырв. бантам. Акрамя старшага былі меншы С., другі С., трэці С. і г.д., якія памагалі першаму, а таксама каранны (дамавы) С. — бацька маладога і бацька маладой. Чын С. на вяселлі захоўваецца і ў наш час, хоць і мадэрнізавана. С. называюцца і бацькі маладых (мужа і жонкі) у адносінах адзін да аднаго.

Л.А.Малаш.

СВА́ТАННЕ, с в а т а ў с т в а, с в а т ы, даўні звычай наладжвання шлюбу ў многіх народаў свету, калі жаніх пасылае сваіх прадстаўнікоў (сватоў) да бацькоў нявесты прасіць яе сабе за жонку; адзін з этапаў падрыхтоўчага перыяду *вяселля*, у час якога бацькі і нявеста даюць згоду на шлюб. На Беларусі — рэгіянальная назва д р у ж к і (Пружаншчына, Слонімшчына). У С. найчасцей ехалі бацька жаніха, яго старэйшы брат, дзядзька або хто-небудзь з блізкіх сваякоў, абавязкова жанатыя і не ўдаўцы. На ПдЗ Беларусі ў С. магла ўдзельнічаць і замужняя жанчына. Самога жаніха звычайна не бралі. Нярэдка за гал. свата запрашалі кагонебудзь са старонніх, хто добра ведаў рытуалы С. Звычайна сватаць ехалі ў аўторак, чацвер, суботу або напярэдадні якога-небудзь свята ўначы без папярэдняй дамоўленасці або пасля яе. У першым выпадку сваты частавання і падарункаў не бралі, у другім — бралі. Часта сваты прыходзілі нечакана ў будны дзень, каб паглядзець парадак у хаце, як выглядае і апранута нявеста ў час працы.

Перад ад'ездам у С. сватоў частавалі, благаслаўлялі, жадалі поспеху. Сваты не павінны былі адразу заходзіць у хату, а стукалі ў акно і прасілі пусціць іх нанач, выдаючы сябе за падарожных, паляўнічых, купцоў і г.д. Увайшоўшы ў хату, сваты не адразу гаварылі пра мэту прыходу, спыняліся перад першай бэлькай, не віталіся за руку, не ішлі адразу да стала, а калі іх запрашалі, садзіліся на лаву каля сцяны ад двара (паводле нар. прыкмет, садзіцца на лаву каля сцяны ад вуліцы азначала, што адзін з маладых аўдавее). У час С. гаварыліся спец. прымаўкі, прыказкі, намёкі, прыгаворы, іншасказанні, умоўныя формулы. У большасці формул захаваліся рэшткі паляўнічага, жывёлагадоўчага, земляробчага спосабаў жыцця продкаў, водгукі стараж. звычаю куплі-продажу нявесты. У С. ездзілі нярэдка да трох разоў. Другі раз прыязджалі з жаніхом. Калі сваты заходзілі ў хату, нявеста хавалася. А калі яе запрашалі выйсці да сватоў, усяляк аднеквалася. Часам яна не хавалася, а дэманстравала перад сватамі сваю працавітасць. Сватоў частавалі (абавязкова былі сыр і яешня), потым сват і бацька нявесты паціскалі адзін аднаму рукі, папярэдне накрыўшы іх крысом.

У час С. бакі гаварылі пра падрыхтоўку да вяселля і тэрмін запоін. Пра *пасаг* дамаўляліся папярэдне. Перад ад'ездам сватоў маці нявесты давала ім загорнуты ў ручнік свой рытуальны хлеб, які, як і хлеб жаніха, называўся мінельнікам, і бутэльку з-пад гарэлкі, у якую насыпала жыта і абвязвала яе каляровым поясам. У выпадку адмовы ад шлюбу аднаго з бакоў апошні адсылаў мінельнік назад, а нявесце, акрамя таго, вярталі з бутэлькай жыта. У выпадку адмовы сяброўкі нявесты імкнуліся ўваткнуць у сані або воз сватоў дзяркач («галень»). Нярэдка з воза сватоў сяброўкі нявесты выбіралі сена і салому і пасыпалі імі сцежкі да сваіх хат, што павінна было азначаць хуткі прыезд да іх сватоў. Калі нявеста абвязвала сватоў ручнікамі, гэта з'яўлялася знакам згоды на шлюб. Пасля С. спраўлялі *заручыны*.

Літ.: Вяселле: Абрад. Мн., 1978.

Л.А.Малаш.

СВАТАШЫ́ЦЫ, вёска ў Дабрынскім с/с Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса. За 13 км на ПдУ ад г. Дуброўна, 115 км ад Віцебска, 18 км ад чыг. ст. Асінаўка. 412 ж., 140 двароў (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

К.**Сваяк**.

СВА́ТКІ, вёска ў Мядзельскім р-не Мінскай вобл., на р. Вузлянка, каля аўтадарогі Мядзел—Крывічы. Цэнтр сельсавета і с.-г. прадпрыемства імя М.Танка. За 20 км на ПдУ ад г. Мядзел, 110 км ад Мінска, 10 км ад чыг. ст. Княгінін. 564 ж., 188 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СВАТО́Ў, другая назва горада *Шаньтоў* у Кітаі.

СВА́ЦЦЯ, с в а х а, 1) адзін з галоўных вясельных чыноў з боку жаніха — замужняя жанчына, якая ўдзельнічала ў *сватанні* нявесты, вяла перагаворы з яе бацькамі пра шлюб да сватання. 2) Замужняя (радзей незамужняя) удзельніца вяселля з боку жаніха і з боку нявесты. 3) Маці жаніха (або іншая старэйшая сваячка жаніха) і маці нявесты (або інш. старэйшая замужняя сваячка нявесты ў адносінах найперш адна да адной, а таксама да інш. сваякоў і інш. удзельнікаў вяселля) з процілеглага боку, звычайна пасля дасягнення бакамі дамоўленасці пра шлюб. Большая С. (першая, старшая) пасля прыезду вясельнай працэсіі жаніха да дому нявесты запальвала свечкі з караваю ад агню, раскладзенага ў варотах, цалавалася праз парог з маці нявесты, якая ад яе свечкі запальвала сваю, потым яны злеплівалі абедзве свечкі разам, слала пасцель маладым, завівала маладую, паказвала вясельнікам яе шлюбную сарочку і г.д. Гал. атрыбуты большай С. — кветка (вяночак) на галаве за наміткай, хлеб (або 2 піражкі) у руках. Чын С. на вяселлі часам захоўваецца і ў наш час. *Л.А.Малаш.*

СВАЯ́К Казімір (сапр. С т а п о в і ч Канстанцін Мацвеевіч; 19.2.1890, в. Барані Астравецкага р-на Гродзенскай вобл. — 6.5.1926), бел. пісьменнік. Скончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю (1914). У 1915 пасвячоны ў ксяндза. Абавязкі ксяндза спалучаў з

адукацыйна-асветнай работаю: адкрываў бел. школы, збіраў бел. фальклор, казанні ў касцёле гаварыў па-беларуску, за што зазнаў нападкі касцельнай іерархіі. Друкаваўся з 1913. Аўтар публіцыст. трактата аб шкоднасці п'янства «Алкаголь» (1913), п'есы «Янка Канцавы» (1920), зб. вершаў «Мая ліра» (1924), вершаванага апавяд. «Чарку дай, браце» (1926), драм. паэмы «Купалле» (1930), філас. дзённіка «Дзея маёй мыслі, сэрца і волі» (1932). Пісаў вершы, апавяданні, эсэ, філас. эцюды, гумарэскі, публіцыст. артыкулы рэліг. і літ.-крытычнага зместу (нарыс пра Ф.Багушэвіча, арт. пра аповесць М.Гарэцкага «Дзве душы») і інш. Найб. раскрыўся ў паэзіі: творы прасякнуты патрыят. думкамі і гуманіст. ідэямі, напоўнены высокай духоўнасцю, ранімай чалавечнасцю, устаноўкай на асветніцтва, пошукамі «найвышэйшай справядлівасці».

Тв.: У кн.: Ростані волі. Мн., 1990.

Літ.: Станкевіч А. З жыцьця і дзейнасці Казімера Сваяка. Вільня, 1936; Калеснік У. Зорны спеў. Мн., 1975; Станповіч Б. З успамінаў пра Казіміра Сваяка // Полымя. 1990. № 2. *І.Э.Багдановіч.*

СВАЯ́ТЫЧЫ, вёска ў Жарабковіцкім с/с Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл., на левым беразе р. Ведзьма. За 16 км на ПнУ ад г. Ляхавічы, 236 км ад Брэста, 8 км ад чыг. ст. Пагарэльцы. 342 ж., 148 двароў (2001). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — парк (2-я пал. 18 ст.).

Вядомы з 1506 як мястэчка ў ВКЛ, уласнасць Петкавічаў; у 16—18 ст. у Новагародскім пав. З 1793 у Рас. імперыі, мястэчка ў Навагрудскім пав. Слонімскай, з 1797 — Літоўскай, з 1801 — Гродзенскай, у 1842—1920 — Мінскай губ. (у 1919—20 у Баранавіцкім пав.). У 1886 — 705 ж., 75 двароў, царква. У 1-й чвэрці 19 ст. М.Абуховіч пабудаваў у С. палац у стылі позняга класіцызму, дзе размяшчаліся карцінная галерэя (творы Ю.Пешкі, Ф.Рушчыца і інш.), габелены, архіў уладальніка маёнтка, б-ка (5 тыс. тамоў). Зборы загінулі ў 1-ю сусв. вайну. У 1920—39 С. ў складзе Польшчы, мястэчка ў Дараўскай гміне Баранавіцкага пав. Навагрудскага ваяв., 715 ж. (1921). З 1939 у БССР, з 1940 вёска ў Навасёлкаўскім с/с Ляхавіцкага р-на Баранавіцкай, з 1954 — Брэсцкай абл.

СВАЯ́ЦТВА, гл. ў арт. *Роднасць і свояцтва.*

СВЕ́АБО́РГ, Суаменліна (швед. Sveaborg, фін. Suomenlinna), горад-крэпасць у Фінляндыі, на а-вах Фінскага зал., каля ўваходу ў Хельсінкі.

Засн. шведамі ў 2-й пал. 18 ст. Асн. ўмацаванні пабудаваны ў 1749—70 пад кіраўніцтвам ген. А.Эрэнсверда. У 1809—1917 у складзе Рас. імперыі, адна з баз Балт. флоту. У *Крымскую вайну 1853—56* у жн. 1855 абстраляны англа-франц. флотам, ч. ўмацаванняў узарвана. У 1860—70 крэпасць рэканструявана. У час рэвалюцыі 1905—07 у Расіі тут адбылося ўзбр. выступленне салдат і матросаў (гл. *Свеаборгскае паўстанне 1906*). У 1-ю сусв. вайну нач. Свеаборгскай крэпасці быў з 1915 ген. К.А.*Аляксееўскі*. Ён і інш. вайскоўцы крэпасці, што паходзілі з Беларусі, у 1917—18 удзельнічалі ў бел. руху, у т.л. кантактавалі з арг-цыяй БСГ у Гельсінгфорсе (цяпер Хельсінкі), пратэставалі супраць разгону бальшавікамі І-га Усебел. з'езда.

СВЕАБО́РГСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1906, узброенае выступленне 31 ліп. — 2 жн. салдат і матросаў крэпасці *Свеаборг* у час *рэвалюцыі 1905—07 у Расіі*. Рыхтавалася фінл. ваен. арг-цыяй РСДРП як ч. агульнага паўстання Балт. флоту, але пачалося стыхійна і заўчасна. Адбывалася пад заклікамі звяржэння самадзяржаўя, свабоды народа, перадачы зямлі сялянам. Салдаты і матросы (каля 2 тыс. чал.), якіх узначалілі афіцэры-бальшавікі падпаручнікі А.П.Емяльянаў і Я.Л.Каханскі, авалодалі шэрагам умацаваных астравоў і пачалі артыл. абстрэл цэнтр. часткі крэпасці, дзе знаходзіліся камендант і верная ўраду ч. гарнізона (3 роты з 10). Да паўстанцаў далучыліся атрады фін. Чырв. гвардыі (каля 200 чал.). Разлікі кіраўнікоў С.п., што на дапамогу яму хутка прыйдуць рэв. караблі Балт. флоту з Кранштата, дзе таксама мела адбыцца паўстанне, не спраўдзіліся. Кранштацкае паўстанне пачалося са спазненнем (у ноч на 2 жн.) і было адразу задушана, флот застаўся пад кантролем урада. 1 жн. браняносец «Цэсарэвіч» і крэйсер «Багатыр» пачалі жорсткую бамбардзіроўку пазіцый паўстанцаў, якія 2 жн. спынілі супраціўленне. З удзельнікаў С.п. 43 чал., у т.л. Емяльянаў і Каханскі, расстраляны, каля 1 тыс. чал. прыгавораны да катаргі, турмы і дысцыплінарных рот.

СВЕ́АЛАНД (Svealand), гістарычная вобласць у Швецыі. Займае сярэднюю частку краіны. Пл. 81 тыс. км². Нас. каля 3,5 млн. чал. (2000). Большую частку тэр. займаюць нізінныя раўніны вакол азёр Меларэн, Ельмарэн, Венерн; на Пн — узвышаны раён. Пераважаюць хвойныя лясы. Вобласць дае больш за 40% прамысл. прадукцыі краіны. Прам-сць: маш.-буд., металаапр., чорная металургія, цэлюлозна-папяровая. У сельскай гаспадарцы пераважае збожжавае земляробства і малочная жывёлагадоўля. Важнейшыя гарады і прамысл. цэнтры: *Стакгольм*, *Упсала*, *Вестэрос*, *Эскільстуна*, Эрэбру, Карльстад. У 11—16 ст. на тэр. С. склалася гіст. ядро шведскай дзяржавы.

СВЕ́ВА (Svevo) Італа [сапр. Шміц (Schmitz) Этторэ; 19.12.1861, г. Трыест, Італія — 13.9.1928], італьянскі пісьменнік. Аўтар аўтабіягр. раманаў «Жыццё» (1892), «Старасць» (1898). Вядомасць прынеслі раман «Самапазнанне Дзена» (1923) і «Аповесць пра добрага старога і прыгожую дзяўчыну» (выд. 1929), у якіх героі даследуюцца аўтарам пры дапамозе паглыбленага псіхааналізу ў формах, блізкіх да л-ры «плыні свядомасці». Аўтар апавяданняў («Кароткае сентыментальнае падарожжа», выд. 1949), п'ес («Камедыі», выд. 1960), нарысаў.

Тв.: Рус. пер. — По-предательски // Итальянская новелла XX в. М., 1969.

Літ.: Грамши А. «Открытие» Итало Свево // Грамши А. О литературе и искусстве. М., 1967.

СВЕ́ВЫ, свебы (лац. Suevi, Suebi), зборная назва шэрагу стараж.-герм. плямён (семноны, гермундуры, квады і інш.), якія займалі ў 1 ст. да н.э. — 2 ст. н.э. басейны рэк Эльба, Майн, Некар, верхні Рэйн. Упершыню апісаны Ю.*Цэзарам*, які ў 58 да н.э. нанёс паражэнне С. пад кіраўніцтвам герм. правадыра *Арыявіста*. У 409 н.э. С. з Верхняга Дуная перасяліліся на Пірэнейскі п-аў, дзе стварылі сваё каралеўства (у 585 заваявана вестготамі).

Т.Сведберг.

СВЕ́ДБЕРГ (Svedberg) Тэадор (30.8.1884, Вальба, каля г. Гаўле, Швецыя — 26.2.1971), шведскі фізікахімік. Чл. Каралеўскай швед. АН (1912), замежны чл. АН СССР (1966). Скончыў Упсальскі ун-т (1907), дзе і працаваў (з 1921 праф.). З 1949 дырэктар Ін-та ядз. хіміі (г. Упсала). Навук. працы пераважна па калоіднай хіміі, электрафарэзе, фізікахіміі бялкоў. Эксперыментальна пацвердзіў распрацаваную А.Эйнштэйнам і М.Смалуховўскім тэорыю броўнаўскага руху, даказаў рэальнасць існавання малекул. Прапанаваў метад ультрацэнтрыфугавання для выдалення калоідных часцінак з растворaў (1919), у т.л. для седыментацыі бялкоў. Стварыў першую аналіт. ультрацэнтрыфугу, якая забяспечвала паскарэнне $5 \cdot 10^3 g$ (1923). Вызначыў малекулярную масу і форму малекул бялкоў (1926). Нобелеўская прэмія 1926.

СВЕДЗЬ, рака ў Калінкавіцкім, Светлагорскім і Рэчыцкім р-нах Гомельскай вобл., правы прыток р. Бярэзіна (бас. р. Дняпро). Даўж. 49 км. Пл. вадазбору 625 км². Пачынаецца за 1,5 км на Пд ад в. Падлукі Калінкавіцкага р-на, вусце за 3 км на У ад в. Сведскае Рэчыцкага р-на. Цячэ па паўн. частцы Гомельскага Палесся. Даліна невыразная, у сярэднім цячэнні месцамі трапецападобная, шыр. 1—3 км. Схілы выш. 5—7 м, спадзістыя. Пойма двухбаковая, шыр. 0,5—1 км, моцна перасечаная меліярацыйнымі каналамі. Рэчышча шыр. 10—20 м, каналізаванае, акрамя невялікага ўчастка каля вусця.

СВЕ́ДКА ў юрыспрудэнцыі, асоба, адносна якой ёсць падставы меркаваць, што ёй вядомы нейкія акалічнасці па крымін., адм. або цывільнай справе, выкліканая органам, што вядзе следства, справу аб адм. правапарушэнні, або судовы працэс, для дачы паказан-

няў. Асоба, выкліканая ў якасці С., абавязана з'явіцца па выкліку і даць праўдзівыя паказанні. За адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў, за дачу заведама ілжывага паказання па крымін. і цывільных справах С. нясе крымін. адказнасць у адпаведнасці з законам. Працэсуальнае заканадаўства Рэспублікі Беларусь вызначае кола асоб, якія не падлягаюць допыту ў якасці С.: *падазроныя*; асобы, што па ўзросце, фіз. або псіхічным стане здароўя не здольны правільна ўспрымаць акалічнасці, што належаць высвятленню па справе, і некат. інш. *Э.І.Кузьмянкова.*

СВЕ́ДКІ ІЕГО́ВЫ, іегавісты, адна з позніх плыняў *пратэстантызму*. Засн. ў ЗША Ч.Т.Раселам, які ў 1870 арганізаваў групу па вывучэнні Біблії (адсюль назва «С.І.» — даследчыкі Свяшчэннага Пісання). З 1931 афіц. назва С.І.; іх дзейнасць зафіксавана ў 232 краінах (больш за 5 млн. чал.). Сусв. цэнтр у Брукліне (раён Нью-Йорка). У веравучэнні С.І. запазычаны некат. дактрыны адвентыстаў 7-га дня (спачатку Расел быў адвентыстам). Некат. даследчыкі лічаць, што папярэднікай С.І. была рас. секта іегавістаў М.С.Ільіна (1809—90; вучыўся ў школе пры Полацкай езуіцкай акадэміі, дзе пазнаёміўся з зах. тэалогіяй). Для С.І. характэрны спецыфічны падыход да традыц. хрысціянскай дагматыкі: адмаўленне бессмяротнасці душы і веры ў існаванне раю і пекла, своеасаблівая трактоўка Тройцы. Крыніцай усяго жывога і існага, усемагутным і адвечным творцам лічаць Бога Іегову, а Ісуса Хрыста — яго адзінародным сынам, створаным непасрэдна Іеговай. Гісторыю грамадства яны разглядаюць як барацьбу паміж Іеговай і Сатаной, якая павінна завяршыцца бітвай — Армагедонам. Праведнікі — С.І. (144 тыс. выбраннікаў) знойдуць вечнае жыццё ў тэакратычнай дзяржаве Іеговы — раі на Зямлі, астатнія загінуць у бітве. У С.І. няма царк. іерархіі, кожны вернік можа быць прапаведнікам. Афіц. рэліг. свята адно — святкаванне штогод Вечарыны ўспамінаў аб смерці Ісуса Хрыста, на якой адбываецца прычашчэнне хлебам і віном. Словы Ісуса пра тое, што яго вучні павінны быць «не гэтага свету», трактуецца С.І. літаральна, што вядзе да іх самаізаляцыі ў грамадскім жыцці і нярэдка да канфлікту з уладамі з-за адмовы служыць у арміі, удзельнічаць у выбарах і інш. С.І. вядуць актыўную місіянерскую дзейнасць. На Беларусі першае т-ва даследчыкаў Свяшчэннага Пісання зафіксавана ў 1925 у Брэсцкім пав. Паводле афіц. звестак польскіх улад, у 1929 у Палескім ваяв. былі 2 групы іегавістаў (87 чал.). У Зах. Беларусі распаўсюджваліся іегавісцкія выданні: час. «Башня стражи» (пазней «Сторожевая башня»), кнігі іх тагачаснага кіраўніцтва І.Ф.Рутэрфорда «Арфа Божая», «Ці могуць жывыя гаварыць з памерлымі?», «Пажаданы ўрад», «Фотадрама тварэння» і інш. У сав. час дзейнасць іегавісцкіх груп і абшчын была забаронена, з 1990-х г. легалізавана. На Беларусі існуе Рэсп. аб'яднанне С.І. (2000), якое складаецца з 21 абшчыны.

Літ.: Иеговизм. Мн., 1981.

А.У.Верашчагіна.

СВЕ́ЛІНК (Sweelinck, Swelink) Ян Пітэрсзан (1562, г. Дэвентэр, Нідэрланды — 16.10.1621), нідэрландскі кампазітар, арганіст; заснавальнік школы ігры на аргане. Развіваў традыцыі *нідэрландскай школы*, узбагаціў іх дасягненнямі італьян. і англ. майстроў. Віртуознае выканальніцкае майстэрства С. спалучалася з эмацыянальнасцю, тонкай апрацоўкай дэталей. Аўтар твораў для органа (фантазіі, рычэркары, такаты, апрацоўкі харалаў), вак. твораў (шансон, псалмы, матэты і інш.), трактата аб правілах кампазіцыі. Сярод вучняў *С.Шайт*, *М.Прэторыус*.

СВЕМП, Свемпс (Svemps) Лео (19.7.1897, хутар Барану, цяпер Гулбенскі р-н, Латвія — 7.3.1975), латышскі жывапісец. Нар. маст. СССР (1963). Вучыўся ў студыі А.Бальшакова (1917) і ў Вышэйшых маст.-тэхн. майстэрнях (1918) у Маскве. З 1918 у Латвіі. Чл. «Групы рыжскіх мастакоў» (1928—38). Выкладаў у АМ у Рызе (1940—41, 1944—52, з 1954, з 1947 праф., з 1961 рэктар). Аўтар маляўнічых, мажорных, паводле ўнутр. ладу, кантрастных па колеры пейзажаў і нацюрмортаў: «Вуліца, асветленая сонцам» (1922), «Старая Рыга» (1927), «Нацюрморт. Кветкі» (1955), «Весціена» (1956), «Нацюрморт з грушамі і кветкамі» (1966), «Нацюрморт з газетай» (1967) і інш. Дзярж. прэмія Латвіі 1957.

Літ.: Буторина Е.И., Иванов М. Л. Лео Свемп. М., 1968.

СВЕ́НСЕН (Svendsen) Юхан Северын (30.9.1840, Осла — 14.6.1911), нарвежскі кампазітар, скрыпач, дырыжор; адзін з заснавальнікаў нарв. кампазітарскай школы. Вучыўся у Лейпцыгскай кансерваторыі (1863—67). З 1871 канцэртмайстар аркестра муз. т-ва ў Лейпцыгу, у 1872—77 (да 1874 з Э.Грыгам) і 1880—83 узначальваў Муз. т-ва Хрысціяніі. У 1883—1908 гал. капельмайстар аркестра Каралеўскага т-ра ў Капенгагене. Яго музыка пабудавана на ладава-інтанацыйнай аснове нарв. фальклору, вызначаецца яскравым каларытам, ёй уласцівы рысы ням. рамантызму. Зрабіў значны ўплыў на развіццё муз. жыцця сканд. краін. Сярод твораў: 2 сімфоніі (1867, 1876), 4 нарв. рапсодыі (1872—77), сімф. паэма «Зарахайда», п'еса «Карнавал нарвежскіх артыстаў» (1874), канцэрты для скрыпкі (1870) і віяланчэлі (1871) з арк., камерна-інстр. ансамблі, хоры, рамансы і песні, апрацоўкі нар. песень і інш.

І.Ю.В'югінава.

СВЕНСК, вёска ў Слаўгарадскім р-не Магілёўскай вобл., каля р. Касалянка, на аўтадарозе Слаўгарад—Рагачоў. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 18 км на ПдЗ ад г. Слаўгарад, 86 км ад Магілёва, 80 км ад чыг. ст. Крычаў. 598 ж., 210 двароў (2001). Сярэдняя школа, фізкультурна-аздараўленчы комплекс, б-ка, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — парк (пач. 20 ст.).

СВЕНТАКШЫ́СКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Województwo Świętokrzyskie), адм.-тэр. адзінка на Пд Польшчы. Утворана 1.1.1999. Пл. 11,4 тыс. км². Нас. 1,3 млн. чал. (1999), гарадскога 47%. Адм. цэнтр — г. *Кельцы*. Найб. гарады: Астровец-Свентакшыскі, Скаржыска-Каменна, Старахавіцы, Сандамір. Размешчана пераважна на Келецка-Сандамірскім узв., у межах якога вылучаюцца *Свентакшыскія горы*. Клімат умераны. Сярэдняя т-ра студз. ад -4,5 °С у Свентакшыскіх гарах да -2,5 °С на Пд, ліп. 16,5 °С і 18,5 °С адпаведна. Гал. рака Вісла з прытокамі Ніда, Каменна, Чарна. Глебы падзолістыя, на У бурыя і чарназёмныя. Пад лесам 27%. Гаспадарка аграрна-прамысловая. С.-г. ўгоддзі займаюць каля 63%. Вырошчваюць пшаніцу, ячмень, жыта, цукр. буракі, бульбу, рапс. Садоўніцтва (асабліва каля Сандаміра). Гадуюць буйн. раг. жывёлу, коней, птушак. Прам-сць: маш.-буд. (трансп., эл.-тэхн.), чорная металургія (электрасталь, пракат), буд. матэрыялаў (цэмент, шкло, кераміка і інш.), харч. (цукр., кансервавая і інш.), лёгкая (швейная, абутковая). Здабыча жал. руды, сыравіны для буд. матэрыялаў. Турызм. Бальнеагразевы курорт Буска-Здруй.

СВЕНТАКШЫ́СКІЯ ГО́РЫ (Świętokrzyskie Góry), горы ў Польшчы, найб. высокая ч. Келецка-Сандамірскага ўзв. Даўж. каля 80 км, выш. да 612 м (г. Лысіца). Складзены з кварцытаў, граўвакаў, пясчанікаў і вапнякоў, якія часта перакрыты рыхлымі (у т.л. марэннымі) адкладамі. Рэльеф узгорыста-градавы; месцамі развіты куэсты. Каля падножжаў дубовыя і хваёвыя, на схілах букавыя і піхтавыя лясы. У найб. высокай ч. гор Свентакшыскі нар. парк.

СВЕНТАРЖЭ́ЦКІ Баляслаў Часлававіч [1831, маёнтак (цяпер вёска) Багушэвічы Бярэзінскага р-на Мінскай вобл. — 1888], адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—64. Вучыўся ў Віленскім дваранскім ін-це, Пецярбургскім ун-це; у час эміграцыі — у ваен. школе ў Францыі. Служыў у Мінскім дваранскім дэпутацкім сходзе. З 1860 знаходзіўся пад сакрэтным наглядам паліцыі. Як член Мінскага губ. к-та ўдзельнічаў у распрацоўцы ўмоў *сялянскай рэформы 1861*. У 1863 паўстанцкі камісар Мінскай губ. Знаходзіўся пры атрадзе С.Ляскоўскага. Увосень 1863 эмігрыраваў. Сядзіба Свентаржэцкіх у Багушэвічах была знішчана паводле загаду М.М.Мураўёва.

Літ.: Кісялёў Г.В. На пераломе дзвюх эпох: Паўстанне 1863 г. на Міншчыне. Мн., 1990. *Г.В.Кісялёў.*

СВЕНТАСЛА́ЎСКІ (Świętosławski) Войцех Алаізій (3.7.1881, в. Кірыёўка Жытомірскай вобл., Украіна — 29.4.1968), польскі фізікахімік, заснавальнік школы тэрмахімікаў. Чл. Польскай АН (1952). Скончыў Кіеўскі політэхн. ін-т (1906). З 1910 у Маскоўскім ун-це. З 1918 у Польшчы: праф. Варшаўскага політэхн. ін-та (1918—39, 1946—51) і Варшаўскага ун-та (1918—29, 1947—60). У 1935—39 міністр вышэйшай адукацыі Польшчы. У 1940—46 у ЗША. У 1955—61 дырэктар Ін-та фіз. хіміі Польскай АН. У 1928—32 і 1934—40 віцэ-прэзідэнт Міжнар. саюза тэарэт. і прыкладной хіміі. Навук. працы па тэрмахіміі арган. злучэнняў, тэорыі працэсаў каксавання і перапрацоўкі кам.-вуг. смалы. Распрацаваў шэраг каларыметрычных метадаў. Сканструяваў адыябатычны каларыметр (1913), эбуліяметр для хуткага вызначэння малекулярнай масы (эбуліяметр С.; 1924).

СВЕНТАХО́ЎСКАЯ Валянціна Міхайлаўна (н. 19.1.1938, Мінск), бел. мастак. Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1966). З 1961 выкладала ў Мінскай гар. маст. школе, у 1970—95 у Рэсп. школе-інтэрнаце па музыцы і выяўл. мастацтве. Працуе ў жанрах нацюрморта, пейзажа, тэматычнай карціны. Творчасці ўласцівы дакладнасць прапрацоўкі элементаў, ураўнаважанасць кампазіцыі, гармонія колеравых спалучэнняў. Сярод лепшых работ: «Снеданне» (1968), «Яблыкі» (1973), «На радзіме А.Пашкевіч (Цёткі)» (1976), «Памяці Галі Вішнеўскай» (1978), «Свята Перамогі» (1982), «Сынам Радзімы» (1984), «Вясельны нацюрморт» (1988), дыптых «Ушанаванне паэта» і «Сум па паэце», прысвечаны М.Багдановічу (1991), «Лілеі маім бацькам» (1992), «Кветкі і яблыкі» (1996), «Беларускі пейзаж» (1997); габелены «Шляхі паэта» (1980), «Дарогамі асветніка Ф.Скарыны» (1990). Аформіла кнігі Цёткі, Л.Геніюш. *Г.А.Фатыхава.*

СВЕНТАХО́ЎСКІ Пётр Уладзіміравіч (н. 19.3.1939, в. Зубачы Камянецкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. жывапісец. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1966). З 1966 выкладаў у Рэсп. школе-інтэрнаце па музыцы і выяўл. мастацтве, у 1971—77 і з 1986 — у Бел. АМ. Працуе ў жанрах сюжэтна-тэматычнай карціны, партрэта, пейзажа. Творам уласцівы лаканізм выяўл. сродкаў, эпічнае гучанне, унутраны драматызм: «Трывога» (1966), «Вартавы» і «Пагранічнікі» (1970), «Вартавыя спакою» (1973), «Навальніца» (1980), «Вяселле ў Міры» (1984), «Подых стагоддзяў», «Развітанне з маці», «Ліпеньскі ранак» (усе 1990), «Танкавы бой» (1994), «Стары гасцінец» (1999), «Грамадскае прызнанне» (2000). Аўтар партрэтаў Ц.Гартнага (1983), Л.Шчамялёва (1986), Л.Геніюш і Ефрасінні Полацкай (1992). *Г.А.Фатыхава.*

В.**Свентахоўская**. Свята Перамогі. 1982.

Свербігуз усходні.

СВЕРБІГУ́З (Bunias), род кветкавых раслін сям. крыжакветных. 6 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн. Афрыцы. На Беларусі 1 від — С. усходні (B. orientalis). Трапляецца на лугах і ў агародах, у пасевах, каля дарог.

Адна-, двух- і шматгадовыя травяністыя расліны выш. да 120 см. Сцёблы прамастойныя або ўзыходныя, галінастыя, апушаныя. Лісце чаргаванае, перыста-раздзельнае, апушанае. Кветкі дробныя, жоўтыя або белыя, у шчыткападобна-мяцёлчатых суквеццях. Плод — стручочак. Лек., харч. (маладое лісце і сцёблы), меданосныя расліны, некат. — пустазелле.

А.М.Скуратовіч.

СВЕ́РДЗЕЛ, рэзальны інструмент для *свідравання* адтулін у метале, дрэве, пластмасе і інш. матэрыялах. С. замацоўваюць у *свідравальных станках*, *дрылях*, *калаўротах* і інш.

Адрозніваюць С.: вінтавыя (спіральныя), з накіравальным цэнтрам (цэнтровачныя) і бясцэнтравыя, адно- і двухбаковага рэзання, для атрымання глыбокіх і малых адтулін. У дрэваапрацоўцы выкарыстоўваюць таксама лыжкавыя, смоўжападобныя (для расшырэння адтулін), вітыя і шнэкавыя (для свідравання глыбокіх і чыстых адтулін), коркавыя (для высвідроўвання шыпавых гнёздаў), зянковачныя (для выбаркі канічных упадзін; гл. *Зянкоўка*), універсальныя. Рэзальную частку С. робяць з легіраванай сталі, аснашчаюць пласцінкамі і каронкамі з цвёрдых сплаваў або кампазіцыйных матэрыялаў.

Свердзел: а — будова спіральнага свердла; б — найбольш пашыраныя віды свердлаў (1 — вінтавы з канічнай заточкай, 2 — лыжачны, 3 — цэнтравы, 4 — завіткападобны, 5 — вінтападобны віты, 6 — вінтападобны шнэкавы, 7 — коркавы, 8 — універсальны рассоўны).

СВЕ́РДРУПА АСТРАВЫ́ (Sverdrup Islands), група астравоў на Пн *Канадскага Арктычнага архіпелага*, у групе а-воў Каралевы Елізаветы. Найб. а-вы: Аксель-Хейберг (пл. 40,7 тыс. км²), Элеф-Рынгнес (10,8 тыс. км²), Амунд-Рынгнес (6,1 тыс. км². Агульная пл. каля

75 тыс. км². В-аў Аксель-Хейберг гарысты (выш. да 2140 м), укрыты ледавікамі; астатнія — раўнінныя або ўзгорыстыя. На в-ве Элеф-Рынгнес — метэастанцыя Ісаксен, аэрапорт. Названы ў гонар нарв. палярнага даследчыка О.Свердрупа, які адкрыў шэраг астравоў у 1898—1902.

СВЕ́РДЭЛЬ Леанід Ісакавіч (н. 14.8.1933, г. Крывы Рог Днепрапятроўскай вобл., Украіна), бел. кампазітар. Скончыў Крыварожскі горна-рудны ін-т (1956), Бел. кансерваторыю (1968, кл. А.Багатырова). Працаваў у Крыварожскім НДІ мех. апрацоўкі чорных металаў. З 1963 канцэртмайстар Мінскага пед. ін-та і дзіцячага хору Бел. тэлебачання і радыё. З 1968 выкладчык Маладзечанскага муз. вучылішча, з 1974 — Рэсп. школы-інтэрната па музыцы і выяўл. мастацтве. Аўтар музыкі для дзяцей і юнацтва, якая вызначаецца меладызмам і прастатой апрацовак бел. нар. песень для дзіцячага, мяшанага і жаночага хароў. Сярод твораў: сімфонія, кантаты «Размова з сынам» (абедзве 1968), «Рознакаляровая зямля» (1975), араторыя «Дзень добры, родны край» (1983), сюіта для дзіцячага хору і нар. арк. «Беларускія карцінкі» (1981), харавы цыкл «У заапарку» (1979—87), вак.-харэагр. кампазіцыя «Нам хораша жыць» (1983); балады для хору і сімф. арк. «Лаўскі бой» (1982) і «Песня лясных волатаў» (1987) і інш.; музыка для спектакляў. З 1990 жыве за мяжой. *І.М.Шмелькіна.*

СВЕ́РЖАНСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала з вер. 1941 да кастр. 1942 у в. Свержань Журавіцкага (цяпер Рагачоўскага) р-на Гомельскай вобл. (кіраўнік Т.Ф.Карніенка). Падпольшчыкі збіралі зброю, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, зрывалі ням. фашыстам вываз насельніцтва, хлеба, жывёлы ў Германію, праводзілі дыверсіі, дапамагалі стварэнню падп. груп у суседніх вёсках. Падполле падрыхтавала базу для разгортвання партыз. руху ў раёне і ў кастр. 1942 улілося ў 10-ю Журавіцкую партыз. брыгаду.

СВЕ́РЖАНСКАЯ ФАЯ́НСАВАЯ МАНУФАКТУ́РА. Дзейнічала ў 1742—60 у мяст. *Новы Свержань* Навагрудскага пав. (цяпер вёска ў Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл.). Заснаваў уладальнік мястэчка кн. М.Радзівіл. Працавала больш за 50 чал. Выраблялі пераважна сталовы і аптэчны посуд, а таксама дэкар. куфэркі, шкатулкі, літургічны посуд, фігуры святых да алтароў, бюсты стараж. філосафаў для інтэр'ера б-кі Радзівілаў у Нясвіжскім замку, фаянсавыя белыя і зялёныя пячныя плёткі і інш. Традыцыі зах.-еўрап. (саксонскага) фаянсу набылі тут характэрную мясц. інтэрпрэтацыю; у вырабах адчуваецца ўплыў позняга барока. Узораў С.ф.м. захавалася мала. *Я.М.Сахута.*

СВЕ́РЖАНЬ, назва в. *Новы Свержань* Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. ў 16—18 ст.

Талерка, зробленая на **Свержанскай фаянсавай мануфактуры**.

СВЕ́РЗНА, возера ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ушача, за 23 км на ПдЗ ад г.п. Ушачы. Пл. 0,38 км², даўж. 1,7 км, найб. шыр. 350 м, найб. глыб. 10,1 м, даўж. берагавой лініі 4,5 км. Пл. вадазбору 10 км². Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы выш. 2—9 м, спадзістыя, на Пд і ПдУ выш. 10—12 м, стромкія, пясчаныя, параслі лесам. На Пн і ПнЗ пойма тарфяністая, укрыта хмызняком і лесам. Берагі нізкія, пясчаныя, пад хмызняком, на ПдУ зліваюцца са схіламі. 4 залівы. Дно да глыб. 2—3,5 м пясчанае, ніжэй — сапрапелістае. Зарастае. Пратока ў р. Ушача.

Свердыя:
1 — грузінская;
2 — шматгадовая.

СВЕ́РЦЫЯ (Swertia), род кветкавых раслін сям. гарычкавых. Больш за 70 відаў. Пашыраны ў гарах Еўропы, Азіі, Усх. Афрыкі, Паўн. Амерыкі. Растуць на вільготных або замшэлых альпійскіх лугавінах, па берагах ручаёў. На Беларусі 1 від — С. шматгадовая (S. perennis), занесеная ў Чырв. кнігу. Трапляецца ў забалочаных драбналістых лясах, хмызняках, на тарфяных балотах.

Шматгадовыя травяністыя карэнішчавыя расліны з прамастойнымі, простымі або слабагалінастымі сцёбламі. Лісце ў прыкаранёвай разетцы суцэльнае, эліптычнае, сцябловае — супраціўнае або чаргаванае. Кветкі правільныя, сінія, брудна-фіялетавыя, часам жаўтаватыя, з цёмнымі плямамі, сабраныя ў гронкападобнае або мяцёлчатае суквецце. Плод — каробачка. Лек., дэкар. расліны.
А.М.Скуратовіч.

«СВЕТ», «Свет», газета Беларускага рабоча-сял. пасольскага клуба «*Змаганне*». Выдавалася з 22.6 да 29.7.1929 у Вільні на бел. мове штотыднёва. Асвятляла розныя бакі жыцця насельніцтва Зах. Беларусі. Друкавала матэрыялы пра эканам. і паліт. ўціск, звязаны з пачаткам сусв. эканам. крызісу і пашырэннем у Еўропе, у т.л. і ў Польшчы, нацыяналсацыялізму. Паведамляла пра беспрацоўе, масавыя паліт. кампаніі да Дня барацьбы за мір (1 жніўня), дзейнасць гурткоў ТБШ, кааператываў, прафсаюзаў, разгромленую ўладамі Грамаду, фашызацыю грамадства, пагрозу вайны. Выйшла 8 нумароў, 6, 7, 8-ы нумары канфіскаваны. Закрыта ўладамі.
С.В.Говін.

«СВЕТ МАСТА́ЦТВА», расійскае маст. аб'яднанне, якое сфарміравалася пад эгідай час. «*Мир искусства*». Існавала ў 1898—1904 і ў 1910—24. Узнікла на аснове гуртка маладых мастакоў і аматараў на чале з А.*Бенуа* і С.*Дзягілевым* з мэтай аб'яднання прадстаўнікоў новага пакалення «і як аб'яднанае цэлае заняць месца ў еўрап. мастацтве». Заснавальнікі — Г.Астравумава-Лебедзева, Л.Бакст, І.Білібін, М.Дабужынскі, А.Галавін, І.Грабар, К.Каровін, Б.Кустодзіеў, М.Рэрых (старшыня), Я.Лансерэ, К.Сомаў, В.Сяроў і інш. Праграма «С.м.» мела неарамант. характар і была звязана з сімвалізмам і мадэрнам. Чл. аб'яднання не прымалі акадэмізм, творчасць перасоўнікаў, звярталіся да шырокага кола сфер сучаснага мастацтва (інтэр'ер, тэатр, эстамп, кніга і інш.); выступалі з крытыкай эстэтыкі рус. рэв. дэмакратаў і канцэпцыі У.*Стасава*. Агульнымі для твораў членаў «С.м.» бы-

лі вытанчаны дэкаратывізм, лінеарнасць, якая часам пераходзіла ў арнаментыку, тонкае спалучэнне матавых тонаў. Аб'яднанне наладжвала калектыўныя выстаўкі ў Пецярбургу, Маскве, Кіеве (1912), а таксама арганізавала персанальную выстаўку М.Чурлёніса (1911—12). Мастакі «С.м.» асобнымі экспазіцыямі былі прадстаўлены на міжнар. выстаўцы ў Рыме (1911), з'яўляліся арганізатарамі спектакляў «Рускіх сезонаў» Дзягілева (Парыж, Лондан). У 1904—10 большасць майстроў «С.м.» ўваходзіла ў Саюз рус. мастакоў. *І.М.Скварцова.*

СВЕТАПО́ГЛЯД, сістэма абагульненых поглядаў на прыродны і сацыяльны свет, на месца ў ім чалавека і яго адносіны да асяроддзя, да самога сябе і інш. людзей, а таксама асн. жыццёвыя пазіцыі, каштоўнасныя арыентацыі, перакананні і ідэалы, абумоўленыя гэтымі поглядамі. Носьбітамі С. з'яўляюцца асобы і сац. супольнасці. Інфармацыйны бок С. складаюць *веды* пра свет і чалавека. Перакананні з'яўляюцца стрыжнем С. і сведчаць пра сталасць С. асобы ці сац. супольнасці. У структуру С. ўваходзяць таксама ідэалы, якія выяўляюць вызначальныя мэты, накіраваныя ў будучыню. Ад характару С. залежыць арыентацыя чалавека ў розных сферах жыццядзейнасці: сац.-паліт., прававой, маральнай, рэліг., філас., навукова-тэарэтычнай. Змест С. залежыць ад таго, якой сферы дзейнасці чалавек аддае перавагу. Паводле зместу і грамадскай значнасці адрозніваюць паслядоўна-навук. і ненавук., атэістычны і рэліг., прагрэсіўны і рэакцыйны С., якія па-рознаму ўздзейнічаюць на нормы паводзін, адносіны чалавека да працы, да інш. людзей, побыт, густы, інтарэсы. Сярод тыпаў С. вылучаюць *данавуковы* (звычайны), які фарміруецца з дзяцінства ў працэсе набыцця жыццёвага вопыту пад уздзеяннем непасрэдных умоў жыцця і функцыянуе ў форме стыхійных, тэарэтычна не афармленых традыц. уяўленняў пра свет, і *агульнакультурны*, які ўключае міфалагічны, рэліг., філас., навукова-тэарэт. С., што дамінуюць на пэўных гіст. этапах. *Міфалагічны* С. характарызуецца антрапамарфізмам, ачалавечваннем навакольнага асяроддзя, адушаўленнем сіл прыроды і выяўляецца ў паданнях пра багоў і герояў, злых духаў і інш., а таксама ў міфічных абрадах (гл. *Міфалогія*). *Рэлігійны* С. звязаны з верай у звышнатуральны сусв. пачатак (гл. *Рэлігія*). С. новага і навейшага часоў характарызуецца спалучэннем рэліг., філас. і навукова-тэарэт. тыпаў. *Філасофскі* С. тэарэтычна абагульняе духоўны і практычны вопыт у форме агульных паняццяў — катэгорый і стварае катэгарыяльныя мадэлі свету. Тэарэт. аснова С. — *філасофія*. Яна абагульняе дасягненні навук аб прыродзе і грамадстве, садзейнічае пераадоленню фрагментарнасці ведаў і дасягненню цэласных уяўленняў аб свеце. Цэнтр. праблема С. — суадносіны свету і чалавека — разглядаюцца як пытанне суадносін матэрыі і свядомасці. *Навукова-тэарэтычны* С. узаемадзейнічае з філас. С., абагульняе прыродазнаўчыя, тэхн., сац.-эканам. і культ.-гіст. веды і стварае адзіную навук. карціну свету.

Літ.: Елсуков А.Н. Познание и миф. Мн., 1984; Философия и мировоззрение. М., 1988; Социальная сила знания. Мн., 1991; Спиркин А.Г. Философия. М., 1998; Степин В.С. Теоретическое знание. М., 2000. *В.Дз.Марозаў.*

«СВЕ́ТАЧ» («Swietač»), грамадска-палітычная газета ліберальна-асветніцкага кірунку. Выдавалася з 1(14).11 да 31.12.1916 (13.1.1917) у Петраградзе на бел. мове лацінкай штотыднёва. Рэдактар-выдавец Э.*Будзька*. Прызначалася для беларусаў-католікаў. Прапагандавала ідэі культ.-нац. адраджэння Беларусі з клерыкальна-каталіцкім ухілам. Выступала за пашырэнне кааперацыі, школ на роднай мове, газет, культ.-асв. гурткоў. Інфармавала пра падзеі 1-й сусв. вайны, дзейнасць Бел. т-ва ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны, паведамляла пра бел. вечарынку, на якой ставіліся п'есы М.Крапіўніцкага «Па рэвізіі» і А.Валодзьскага «Як яны жаніліся». Друкавала творы А.Паўловіча, А.Зязюлі, высока цаніла творчасць Г.Сянкевіча, падкрэслівала, што ён выводзіў «свае тыпы з нашага краю». У арт. «Думкі да граматыкі» Будзькі (пад псеўд. Акцуб) адзначалася неўнармаванасць бел. мовы ў выданнях «Нашай нівы» і суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца», прапаноўваліся нормы правапісу. Выйшла 7 нумароў. *М.В.Біч.*

СВЕ́ТАШАЎ Георгій Данілавіч (н. 16.4.1920, г. Сяміпалацінск, Казахстан), бел. спявак (лірычны тэнар). Засл. арт. Беларусі (1963). Скончыў Алма-Аціnскую кансерваторыю (1953). З 1952 у ансамблях пагранвойск, з 1958 саліст Ансамбля песні і танца БВА, у 1981—87 артыст Дзярж. акад. харавой капэлы Беларусі імя Р.Шырмы. Валодае голасам цёплага тэмбру, выкананне вылучаецца шчырасцю і лірызмам. У рэпертуары песні бел. і рас. кампазітараў ваен.-патрыят. тэматыкі, бел. і інш. нар. песні, рамансы, арыі з опер. *А.Я.Ракава.*

СВЕТЛАВА́Я ПРАЭ́КЦЫЯ, утварэнне на экране відарыса аб'екта, змешчанага на шляху светлавых прамянёў. Асн. спосабы атрымання С.п.: ценявая праекцыя (непразрысты ці паўпразрысты аб'ект размяшчаецца паміж крыніцай святла і экранам), з дапамогай *праекцыйных апаратаў*, *камеры-абскуры* і інш. С.п. — аснова кінатэхнікі, выкарыстоўваецца таксама ў рэнтгенаскапіі, мікрафільмаванні і інш.

СВЕТЛАВА́Я ЭНЕ́РГІЯ, фізічная велічыня, роўная здабытку *светлавога патоку* на працягласць асвятлення; адна з асн. светлавых велічынь. Вызначаецца як частка энергіі эл.-магн. выпрамянення, якая ўспрымаецца чалавечым вокам ці інш. прыёмнікам святла са спектральнай адчувальнасцю, роўнай адчувальнасці сярэдняга вока. Адзінка С.э. — люмен-секунда (гл. *Люмен*).

СВЕТЛАВО́Е ВЫПРАМЯНЕ́ННЕ, 1) тое, што *святло*. 2) Адзін з паражальных фактараў ядзернай зброі — магутны паток *светлавой энергіі*.

Крыніца С.в. — святлівая вобласць, якая складаецца з нагрэтых да высокай т-ры прадуктаў ядз. рэакцыі, паветра, пары глебы і вады. Выклікае апёкі скуры, пашкоджванне вачэй, узгаранне, асмальванне і аплаўленне розных матэрыялаў. Гл. таксама *Ахова ад радыеактыўных выпрамяненняў*.

СВЕТЛАВО́Е ЗАБРУ́ДЖВАННЕ, форма *фізічнага забруджвання* навакольнага асяро́ддзя, звязаная з перыяд. або пастаянным перавышэннем узроўню натуральнай асветленасці мясцовасці ў выніку інтэнсіўнага выкарыстання крыніц штучнага асвятлення. Характэрна для індустр. цэнтраў, вял. гарадоў і іх кангламерацый. Самастойна або ў спалучэнні з інш. формамі забруджвання здольна прыводзіць да анамалій развіцця жывых арганізмаў, быць прычынай іх вымушанай міграцыі, негатыўна ўплывае на здароўе людзей, біял. рытмы. *П.І.Лабанок.*

СВЕТЛАВЫ́ ВЕ́КТАР, вектар шчыльнасці *светлавога патоку*; фотаметрычны аналаг *Пойнтынга вектара*. Часам С.в. наз. вектар напружанасці эл. поля эл.-магн. хвалі.

СВЕТЛАВЫ́ ГОД, пазасістэмная адзінка даўжыні. Абазначаецца св. год. С.г. роўны адлегласці, якую святло праходзіць за год. 1 св. год = 0,3068 пк = $=9{,}4605\cdot10^{15}$ м. Выкарыстоўваецца ў астраноміі для вымярэння міжзорных адлегласцей. Гл. таксама *Парсек*.

СВЕТЛАВЫ́ ПАТО́К, магутнасць выпрамянення *святла*, якая ацэньваецца па зрокавым адчуванні або ўздзеянні на селектыўны прыёмнік святла, што мае стандартызаваную спектральную адчувальнасць. Роўны здабытку *сілы святла* I на прасторавы вугал ω, у якім распаўсюджваецца дадзены С.п.: $\Phi = I\,\omega$.

Поўны С.п., што выпраменены кропкавай крыніцай святла з сілай святла I, роўны $\Phi = 4\pi I$. У адрозненне ад С.п. *прамяністы паток* P ацэньваецца з дапамогай вымяральных прылад (аб'ектыўна) і звязаны з С.п. суадносінамі $\Phi = kP$, дзе k — светлавы эквівалент магутнасці, залежны ад даўжыні хвалі святла. Адзінка С.п. ў *CI* — *люмен*, прамяністага патоку — *ват*.

СВЕТЛАВЫ́ ЦІСК, ціск, якім *святло* дзейнічае на адбівальныя і паглынальныя целы, часціцы, а таксама на асобныя малекулы і атамы; асобны выпадак *пандэраматорнага дзеяння святла*. Гл. *Ціск святла*.

СВЕТЛАВЫ́Я ЭТАЛО́НЫ, меры для ўзнаўлення, захоўвання і перадачы адзінак светлавых велічынь (*сілы святла*, *асветленасці*, *яркасці*, *светлавога патоку*

і інш.). Забяспечваюць адзінства светлавых вымярэнняў з найвышэйшай дасягальнай дакладнасцю. Бываюць першасныя і другасныя.

Першасны С.э. адзінкі сілы святла (*кандэлы*) ажыццёўлены ў 1948 у выглядзе т.зв. поўнага выпрамяняльніка, які мае ўласцівасці *абсалютна чорнага цела*; яго яркасць $6{\cdot}10^5$ кд/м^2. У 1979 прынята новае вызначэнне кандэлы, якое ўстанаўлівала яе сувязь з адзінкай магутнасці (ватам) монахраматычнага выпрамянення. Другасныя С.э. для адзінак сілы святла, асветленасці, светлавога патоку ўяўляюць сабой групы святловымяральных лямпаў напальвання рознай будовы і колеравай т-ры. Раней С.э. былі: полымя свечкі або лямпы з зададзенымі характарыстыкамі (памерам полымя, відам паліва, скорасцю згарання і інш.).

П.С.Габец.

СВЕТЛАГО́РСК, горад абл. падпарадкавання, цэнтр Светлагорскага р-на Гомельскай вобл. Прыстань на р. Бярэзіна, чыг. ст. на лініі Жлобін—Калінкавічы, вузел аўтадарог на Бабруйск, Жлобін, Гомель, Калінкавічы. 73,4 тыс. ж. (2001).

Горад **Светлагорск**. Забудова мікрараёна Паўднёвы.

Вядомы з 16 ст. як в. Шацілкавічы (пазней Шацілкі) у Рэчыцкім пав. ВКЛ. У 1639 было 19 двароў. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Рас. імперыі, у Парыцкай вол. Бабруйскага пав. Мінскай губ. З 20.8.1924 мяст. Шацілкі — цэнтр сельсавета ў Парыцкім р-не Бабруйскай акр. (1924—30), з 1938 у Палескай вобл. У жн. 1941 акупіраваны нямфашыстамі, якія загубілі тут 353 чал. Вызвалены 26.11.1943 войскамі 1-га Бел. фронту ў выніку *Гомельска-Рэчыцкай аперацыі 1943.* З вер. 1944 у Бабруйскай, з 1954 у Гомельскай абл. З 30.12.1956 гар. пасёлак, з чэрв. 1960 — цэнтр *Парыцкага раёна*. З 1961 горад раённага падпарадкавання, 29.7.1961 перайменаваны ў С., а Парыцкі р-н у Светлагорскі. З 1963 — горад абл. падпарадкавання. У 1970 — 40,3 тыс. ж., у 1973 — 48,7 тыс. жыхароў.

Працуюць: *Светлагорскае вытворчае аб'яднанне «Хімвалакно»*, *Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат*, з-д жалезабетонных вырабаў і канструкцый, філіял з-да «Гомсельмаш», домабудаўнічы камбінат, масласырзавод, хлебазавод, раённае аб'яднанне сельгастэхнікі, *Светлагорская ЦЭЦ*. У горадзе *Светлагорскі індустрыяльны тэхнікум*, ПТУ хімікаў, Дом культуры, Дом дзіцячай творчасці, 9 б-к, *Музей гісторыі горада Светлагорска*. Брацкія магілы сав. воінаў, брацкая магіла сав. маракоў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СВЕТЛАГО́РСК, кліматычны і бальнеагразевы курорт у Расіі (Калінінградская вобл.) на беразе Балтыйскага м. Клімат пераходны ад марскога да кантынентальнага. Асн. лек. фактары: чыстае іанізаванае марское паветра, тарфяныя гразі, гідракарбанатна-натрыевая мінер. вада з павышанай колькасцю арган. рэчываў. Лечаць захворванні сардэчна-сасудзістай і нерв. сістэм, органаў апоры і руху, дыхання. Мінер. вада ўжываецца ў якасці пітнога лячэння пры хваробах органаў стрававання. Санаторыі, пансіянаты, турбаза, грязелячэбніца, пясчаны пляж.

СВЕТЛАГО́РСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. У Светлагорскім р-не Гомельскай вобл., за 11 км на Пд ад г. Светлагорск, каля р.п. Сасновы Бор. Створана ў 1994. Налiўное. Пл. 14,1 км^2, даўж. 6,6 км, найб. шыр. 3,2 км, найб. глыб. 5,1 м, аб'ём вады 60 млн. м^3. Выкарыстоўваецца для ўвільгатнення с.-г. угоддзяў, рыбагадоўлі, адпачынку.

СВЕТЛАГО́РСКАЕ ВЫТВО́РЧАЕ АБ'ЯДНА́ННЕ «ХІМВАЛАКНО́». Буд-ва пачата ў 1960 у пас. Шацілкі Гомельскай вобл. як Шацілкаўскага з-да штучнага валакна. У 1961 са зменай назвы пасёлка на г. Светлагорск адпаведна змянілася назва з-да. У 1965 уведзена ў дзеянне 1-я, у 1967 — 2-я чарга кордавай вытворчасці, у 1969 — вытв-сць серавугляроду, у 1971 — доследна-прамысловая ўстаноўка па вытв-сці корду з розных тыпаў цэлюлозы, на якой у 1976 пасля рэканструкцыі атрымана нітка «Аксалон» для цеплаізаляцыйных вырабаў, у 1980 — участак па вытв-сці вугляродных матэрыялаў. З 1983 — сучасная назва. У 1992 рэканструявана 2-я кордавая вытв-сць, устаноўлены агрэгаты для фармавання віскознай тэкстыльнай ніткі. У 1994 арганізаваны вытв-сці нятканага матэрыялу «Спанбонд», мяшкоў з плёначных поліпрапіленавых нітак, у 1996 — вытв-сць карбаксіметылцэлюлозы. У складзе прадпрыемства з-ды: поліэфірнай тэкстыльнай ніткі, штучнага валакна; вытв-сці: палімерных і вугляродных матэрыялаў, тавараў нар. ўжытку. Асн. прадукцыя (2001): віскозная кордавая тканіна, віскозная і поліэфірная тэкстыльныя ніткі, нятканыя матэрыялы, поліпрапіленавыя мяшкі, тканіна, шпагат; тавары нар. ўжытку (спарт. касцюмы, камплекты для спальні і інш.), вугляродныя матэрыялы, аксалон.

СВЕТЛАГО́РСКАЯ ЦЭЦ. Пабудавана ў 1958 (першая чарга) у г. Светлагорск Гомельскай вобл. як Васілевіцкая ДРЭС. Другая чарга пушчана ў 1965. Пасля ўвядзення ў эксплуатацыю цеплафікацыйных турбін у 1978 ДРЭС атрымала сучасную назву. У 1983—86 усе катлы ЦЭЦ пераведзены на выкарыстанне ў якасці паліва — газу і мазуту. Цяпер асн. паліва — спадарожны гаручы газ нафтавых радовішчаў з *Беларускага газаперапрацоўчага завода* і прыродны газ (з Расіі). ЦЭЦ мае 4 цеплафікацыйныя турбіны, 9 паравых катлоў і 1 воданагравальны кацёл. Магутнасць ЦЭЦ — 260 МВт/гадз электраэнергіі і 841 Гкал/гадз цеплаэнергіі. Забяспечвае цепла- і электраэнергетычныя патрэбы прадпрыемстваў і жыллёва-камунальнага сектара г. Светлагорск.

СВЕТЛАГО́РСКІ ЗАВО́Д СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧАГА МАШЫНАБУДАВА́ННЯ «Светлагорскккормаш». Засн. ў 1978 у р.п. Сасновы Бор Светлагорскага р-на Гомельскай вобл. на базе торфапрадпрыемства «Светлагорскае». З 1978 у ВА «Гомсельмаш». Прадпрыемства складаецца з гал. вытв. механазборачнага цэха і дапаможных (дрэваапр. цэха, рамонтна-інструментальнага, рамонтна-мех., транспартнага і энергацепласілавога ўчасткаў). Асн. прадукцыя (2001): запчасткі да кормаўборачных і збожжаўборачных камбайнаў, сталярныя вырабы.

СВЕТЛАГО́РСКІ ІНДУСТРЫЯ́ЛЬНЫ ТЭ́ХНІКУМ. Засн. ў 1960 у г. Светлагорск Гомельскай вобл. як філіял Маладзечанскага палітэхнікума. З 1965 Светлагорскі вячэрні індустр. тэхнікум, з 1966 Светлагорскі індустр. тэхнікум, з 2001 Светлагорскі дзярж. індустр. тэхнікум. Рыхтуе бухгалтараў, тэхнікаў-будаўнікоў, тэхнікаў-электрыкаў, тэхнікаў суднамеханікаў-суднавадзіцеляў, тэхнікаў водных шляхоў, мадэльераў-канструктараў, тэхнікаў-тэхнолагаў хім. вытв-сці. Спецыяльнасці (2000/01 навуч. г.): бухгалтарскі ўлік, аналіз і кантроль; прамысл. і грамадз. буд-ва; элек-

траэнергетыка; суднаваджэнне і эксплуатацыя рачнога флоту; эксплуатацыя ўнутр. водных шляхоў; тэхналогія і канструяванне швейных вырабаў; тэхналогія вытв-сці хім. валокнаў. Прымае асоб з базавай і сярэдняй адукацыяй. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае.

СВЕТЛАГО́РСКІ РАЁН. Размешчаны на Пн Гомельскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Пл. 1,8 тыс. км^2. Нас. 23,9 тыс. чал. (2001), гарадскога 21%. Сярэдняя шчыльн. 13 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Светлагорск*. Уключае г.п. *Парычы*, р.п. *Сасновы Бор*, 101 сельскі нас. пункт, 9 сельсаветаў: Асташкавіцкі, Баравікоўскі, Давыдаўскі, Казлоўскі, Краснаўскі, Мікалаеўскі, Палескі, Печышчанскі, Чыркавіцкі.

Тэр. раёна знаходзіцца пераважна ў межах *Гомельскага Палесся*, паўн. ч. — *Цэнтральнабярэзінскай раўніны*. Паверхня пласкахвалістая, 95% яе на выш. 130—140 м, найвыш. пункт 160 м (на ПнЗ раёна каля в. Крукі). Агульны нахіл да даліны р. Бярэзіна. Карысныя выкапні: нафта, каменная соль, торф, буд. і сілікатныя пяскі, гліны і суглінкі. Сярэдняя т-ра студз. -6,6 °С, ліп. 18,4 °С. Ападкаў 602 мм за год. Вегетац. перыяд 194 сут. Найб. р. Бярэзіна з прытокамі Ала і Сведзь, Іпа з прытокам Віша. Меліярац. каналы: Пажыхарскі, Баравікоўскі, Яланскі, Нізавы канал (ч.). Светлагорскае водасх. Пераважаюць глебы с.-г. угоддзяў: тарфяна-балотныя (32,7%), дзярнова-падзолістыя (29,6%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (23,2%). Пад лесам 53,7% тэр. раёна. Лясы пераважна хваёвыя, бярозавыя, чорнаальховыя, дубовыя, яловыя; 25% з іх штучныя насаджэнні, у асн. хваёвыя. Найб. лясныя масівы на Пн. Пад балотамі 1,4% тэрыторыі. У межах раёна заказнікі рэсп. значэння: біял. — Чыркавіцкі, ландшафтны — Выдрыца (часткова); біял. мікразаказнік мясц. значэння — Светлагорскі. Помнікі прыроды рэсп. значэння: дубы чарэшчатыя ў Гарохавіцкім і Коўчыцкім лясніцтвах.



Агульная пл. с.-г. угоддзяў 68,7 тыс. га, з іх асушаных 31,5 тыс. га. На 1.1.2001 у раёне 6 калгасаў, 10 с.-г. камунальных унітарных прадпрыемстваў (саўгасаў), 29 фермерскіх гаспадарак, міжгасп. прадпрыемства «Прудок», 5 падсобных гаспадарак вытв. прадпрыемстваў. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, птушкагадоўлі, свінагадоўлі, вырошчванні збожжавых і кармавых культур, бульбы, агародніны і насенняводстве збожжавых і кармавых культур. Прадпрыемствы мэблевай, металаапр. (запасныя часткі для збожжаўборачных і кормаўборачных камбайнаў — *Светлагорскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання*), буд. матэрыялаў (цэгла, вырабы з драўніны), харч. (пладова-агароднінныя кансервы, сметанковае масла, цэльнамалочныя прадукты, сухое малако) прам-сці; лясгас. Па тэр. раёна праходзяць: чыгунка Жлобін—Калінкавічы, аўтадарогі Бабруйск—Мазыр, Жлобін—Светлагорск, Акцябрскі—Парычы—Рэчыца. У раёне 17 сярэдніх, 3 базавыя, 1 пач., 2 спарт., 3 дзіцячыя муз. школы, Цэнтр пазашкольнай працы, дзіцячы прытулак, абласны дзіцячы дом, 22 дашкольныя ўстановы, 43 клубы, 35 б-к, 2 бальніцы, 3 амбулаторыі, 29 фельч.-ак. пунктаў, 1 санаторый. Выдаецца газ. «Светлагорскія навіны».

Г.Я.Будрэвіч, Р.Р.Паўлавец.

СВЕТЛАГО́РСКІ ЦЭЛЮЛО́ЗНА-КАРДО́ННЫ КАМБІНА́Т. Пабудаваны ў г. Светлагорск Гомельскай вобл. ў 1968 (1-я чарга па выпуску гафрыраванага кардону і вырабу з яго тары). У складзе камбіната паступова ўведзены ў эксплуатацыю: з-д бісульфітнай цэлюлозы на магніевай аснове, кардонна-папяровая ф-ка, ф-ка фільтравальнага кардону для харч. вадкасцей, вытв-сці — суцэльнага склеенага кардону, папяровых мяшкоў, папяровых сотаў і вырабаў з іх. З 1993 — адкрытае акц. т-ва. Асн. прадукцыя (2001): 2-, 3-, 5- і 8-слойны гафракардон і скрынкі з яго розных памераў і канфігурацый; кардон каробачны склеены, кардон для фільтрацыі харч. вадкасцей (сокаў, віна, каньяку, шампанскага, піва і інш.), папяровыя мяшкі, пакеты, шпагат, соты і вырабы з іх.

СВЕТЛАСЕ́ЛЬСКАЯ, вёска ў Шумілінскім р-не Віцебскай вобл., каля аўтадарогі Віцебск—Шуміліна. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 2 км на У ад гар. пасёлка і чыг. ст. Шуміліна, 43 км ад Віцебска. 589 ж., 192 двары (2001). Б-ка, раённая бальніца, паліклініка. Касцёл. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СВЕТЛЯКІ (Lampyris), род жукоў сям. Lampyridae, які раней адносілі да *мяккацелак*. Начныя насякомыя, свецяцца ў цемры. Органы свячэння размешчаны на канцы брушка. Жывуць пераважна ў лясах. На Беларусі трапляецца С. з в ы ч а й н ы, ці вялікі, нар. назва іванаў чарвяк.

Даўж. 10—20 мм. Самцы крылатыя, надкрылы буравата-шэрыя, пярэдняспінка жоўта-бурая, добра лятаюць, свецяцца слаба. Самкі бяскрылыя (нагадваюць лічынак), верх цела цёмна-буры, па краях больш светлы. Выпраменьваюць яркае святло, якое прываблівае самцоў. Драпежнікі, кормяцца насякомымі. Развіваюцца ў лясным подсцілe.

СВЕТЛЯЧО́К Янка (сапр. Г а е ў с к і Іван Яфімавіч; 1888, в. Замужанне Барысаўскага р-на Мінскай вобл. — 28.11.1957), бел. пісьменнік. Скончыў Віленскі настаўніцкі ін-т (1912), Мінскі пед. ін-т (1930). Настаўнічаў. Збіраў фальклор на Барысаўшчыне і Лагойшчыне. З 1909 друкаваўся ў газ. «Наша ніва». У карэспандэнцыях расказваў пра цяжкое жыццё сялянства, асабліваст мясцовага побыту. У вершаваным творы «З заработкаў» адлюстраваў жыццё плытагонаў.

Літ.: К а х а н о ў с к і Г. Адчыніся, таямніца часу. Мн., 1984. *Г.А.Каханоўск.*

СВЕ́ТНІК (Coronaria), род кветкавых раслін сям. гваздзіковых. 5 відаў. Пашыраны ва ўмераным поясе Еўразіі, заносныя ў Паўн. Амерыцы. На Беларусі 1 від — С. зязюлін, або зязюлін цвет (C. flos-cuculi), нар. назвы — бурчык, палявая смалянка, чарацвет. Трапляецца на сухіх і забалочаных лугах, тарфяніках, у хмызняках.

Шматгадовыя травяністыя расліны. Сцёблы прамастойныя, апушаныя, выш. да 80 см. Прыкаранёвае лісце ў разетцы, суцэльнае, голае або апушанае, прадаўгавата-лапацістае, сцябловае — вузкаланцэтнае, супраціўнае. Кветкі ружова-чырв., чырв., адзіночныя або ў мяцёлчатых суквеццях. Плод — каробачка. Лек., дэкар., меданосныя расліны.

А.М.Скуратовіч

Светнік зязюлін.

СВЕТО́НІЙ Гай Транквіл (Gaius Suetonius Tranquillus; каля 70 — пасля 122), старажытнарымскі гісторык і пісьменнік. Служыў пры двары Траяна, пры Адрыяне кіраваў імператарскай канцылярыяй. Са шматлікіх твораў С. (гіст., гісторыка-быт. і філалагічных) цалкам захаваліся «Жыццё дванаццаці Цэзараў» (кн. 1—8) і частка «Аб граматыках і рытарах» з вял. працы пра знакамітых рым. пісьменнікаў. У «Жыцці дванаццаці Цэзараў» энцыклапедычна даследуецца жыццё рым. імператараў ад *Цэзара* да *Даміцыяна*, паслядоўна апісваецца паходжанне і юнацтва імпера-

раў, іх паліт., ваен., судовая дзейнасць, рысы характару, знешнасць, звычкі, абставіны смерці. Ідэальнымі правіцелямі С. паказаў Аўгуста і Ціта. Найб. каштоўнасць маюць старонкі твора, дзе выкарыстаны лісты, прамовы, данясенні і дакументы з імператарскага архіва.

Тв.: Рус. пер. — Жизнь двенадцати Цезарей. М., 1993.

мастацтва сапраўды народнае» (1962) і інш. Сярод яго вучняў *У.Мінін*, *В.Роўда*, *А.Юрлоў* і інш. Дзярж. прэмія СССР 1946. Дзярж. прэмія Расіі імя М.Глінкі 1967. *Л.А.Шымановіч.*

СВЁКАР, бацька мужа.

СВЁНТАК Казімір (н. 21.10.1914, г. Валга, Эстонія), рымска-каталіцкі царк.

А.В.**Свешнікаў**.

К.**Свёнтак**.

С.А.**Свідзерскі**.

І.В.**Свідзінскі**.

У.І.**Свідзінскі**.

СВЕТЫЦХАВЕ́ЛІ, сабор у г. *Мцхета*, помнік сярэдневяковай архітэктуры Грузіі. Пабудаваны ў 1010—29 (арх. Арсукісдзе; аднаўляўся ў пач. 15 і 17 ст.) на месцы першай у Грузіі хрысц. царквы 4 ст. Грандыёзны крыжова-купальны, выцягнуты па падоўжанай восі будынак. Зах. частка падзелена на 3 нефы, над ёй — хоры. Купал утрымліваюць 4 свабодна пастаўленыя слупы. Гармоніі арх. аб'ёмаў падначалены ўрачысты рытм аркатур (на фасадзе, барабане купала) з тонкай, па-майстэрску выкананай арнаментальнай разьбой і рэльефамі. У інтэр'еры захаваліся фрагменты размалёвак 16—17 ст. Пад вял. аркай легендарны 4-гранны слуп «светыцхавелі» (жыватворчы), які даў назву храму. Перад алтаром размешчаны магілы груз. цароў. У ансамблі сабора таксама вароты каталікоса Мелхіседэка 11 ст. і агароджа 18 ст. Сабор С. ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*. Іл. гл. да арт. *Грузія*.

Літ.: Памятники архитектуры Грузии. Л., 1973.

СВЕ́ШНІКАЎ Аляксандр Васілевіч (11.9.1890, г. Каломна Маскоўскай вобл. — 3.1.1980), расійскі харавы дырыжор, муз. дзеяч, педагог. Нар. арт. СССР (1956). Герой Сац. Працы (1970). Скончыў муз.-драм. вучылішча Маскоўскага філарманічнага т-ва (1913). З 1921 кіраўнік хар. капэлы ў Палтаве. З 1923 заг. вак. часткі 1-й студыі Маск. Маст. акад. т-ра. З 1928 арганізатар і маст. кіраўнік вак. ансамбля (потым хору) Усерас. радыё. У 1936—37 і з 1941 узначальваў засн. ім Дзярж. хор рус. песні (цяпер Дзярж. акад. рус. хор Расіі), адначасова ў 1937—41 маст. кіраўнік Ленінградскай акад. капэлы. З 1944 арганізатар і маст. кіраўнік Маскоўскага хар. вучылішча, выкладчык Маскоўскай кансерваторыі (з 1946 праф., у 1948—74 рэктар). У яго творчасці спалучаліся шчырасць і непасрэднасць, уласцівыя рус. нар. песням, з багаццем і маляўнічасцю гучання акад. хору. Аўтар шматлікіх апрацовак нар. песень, кн. «Харавыя спевы — дзеяч Беларусі. Скончыў Вышэйшую духоўную семінарыю імя Фамы Аквінскага ў Пінску (1939). У 1939—44 в.а. пробашча парафіі ў Пружанах. У крас. 1941 арыштаваны і зняволены на 2 месяцы ў брэсцкую турму. У снеж. 1944 зноў арыштаваны і асуджаны на 10 гадоў, зняволенне адбываў у лагерах Сібіры і Комі АССР. Пасля вызвалення 16.6.1954 вярнуўся да пастырскай дзейнасці, з 1.12.1954 пробашч парафіі ў Пінску. З 13.4.1991 архібіскуп, мітрапаліт мінска-магілёўскі, апостальскі адміністратар Пінскай рымска-каталіцкай епархіі. 26.11.1993 ад папы Іаана Паўла II атрымаў званне кардынала. *С.Ф.Адамовіч.*

СВІДЗЕ́РСКІ Савелій Аляксеевіч (23.4.1905, в. Дзяньгубка Крупскага р-на Мінскай вобл. — 13.5.1977), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў курсы ўдасканалення камсаставу кавалерыі (1938). У Чырв. Арміі з 1927. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Паўн.-Зах., Калінінскім, Зах., Цэнтр., Бранскім, 1-м і 2-м Бел. франтах, камандзір палка. Палк. С. вызначыўся ў крас. 1945 пры фарсіраванні р. Одэр (Германія) і захопе плацдарма, дзе асабістым прыкладам натхняў воінаў падраздзяленняў свайго палка на рукапашныя схваткі пры адбіцці некалькіх контратак праціўніка. Да 1953 у Сав. Арміі.

СВІДЗІ́НА (Swida), род кветкавых раслін сям. кізілавых. Каля 40 відаў. Пашыраны ва Усх. Азіі і Паўн. Амерыцы, радзей у Еўропе. На Беларусі 1 від — С. крывава-чырвоная (S. sanquinea). Трапляецца на схілах у лісцевых і мяшаных лясах. Больш за 10 відаў прайшлі інтрадукцыйную праверку ў Цэнтр. бат. садзе Нац. АН Беларусі: С. Амома (S. amomum), белая (S. alba), шаўкавістая (S. sericea) і інш. Выведзена шмат садовых форм.

Лістападныя кусты або дрэвы выш. 1,5—6 м. Лісце супраціўнае, суцэльнае, чаранковае. Кветкі белыя, у шчытка- ці парасонападобных галоўчатых суквецьях. Плод — сакаўная, чорная або белая касцянка. З насення атрымліваюць тэхн. алей, чырванаватая драўніна ідзе на такарныя вырабы, з галін плятуць кошыкі і маты. Выкарыстоўваюць С. для замацавання пяскоў і схілаў. Дэкар., тэхн., меданосныя расліны. *А.М.Скуратовіч.*

СВІДЗІ́НСКІ Іосіф Вікенцьевіч (14.1.1918, г.п. Бялынічы Магілёўскай вобл. — 15.11.1996), Герой Сав. Саюза (1943). Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Паўн.-Зах. фронце. Разведчык яфрэйтар С. вызначыўся ў 1943 у час разведкі абароны праціўніка ў раёне Кіева, калі з групай байцоў выявіў агнявыя кропкі ворага, падарваў яго штабную машыну і здабыў важныя разведданыя для камандавання дывізіі.

СВІДЗІ́НСКІ Уладзімір Іванавіч (20.5.1923, г. Віцебск — 16.3.1945), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў курсы мал. лейтэнантаў (1942). У Вял. Айч. вайну з 1941 на Бранскім, Цэнтр., 3-м Бел., 1-м Укр. франтах. Камандзір стралк. роты лейтэнант С. вызначыўся ў 1943 пры фарсіраванні Дняпра на Пн ад Кіева. У Віцебску на тэрыторыі з-да, дзе ён працаваў, установлены бюст.

Свідзіна белая.

СВІ́ДНА, возера ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Галбіца, за 25 км на У ад г. Паставы. Пл. 0,97 км², даўж. 1,45 км, найб. шыр. 980 м, найб. глыб. 11,6 м, даўж. берагавой лініі больш за 4 км. Пл. вадазбору 8,43 км². Катлавіна эварзійнага тыпу. Схілы выш. 4—6 м, спадзістыя, разараныя. Пойма шыр. 10—20 м, забалочаная, укрыта хмызняком. Берагі нізкія, на ПдЗ сплавінныя, на У і З выш. 0,5—0,8 м абразійныя, пясчаныя і пясчана-гліністыя, пад хмызняком. Дно лейкападобнай формы, да глыб. 5 м

выслана пясчанымі і апясчаненымі адкладамі, глыбей гліністым ілам. Зарастае. Сцёк у р. Заражанка.

СВІ́ДНАЕ, вадасховішча ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл., каля в. Свіднае. Створана ў 1986. Пл. 2,2 км^2, даўж. 2,8 км, найб. шыр. 2 км, найб. глыб. 4,6 м, аб'ём вады 5,7 млн. м^3. Наліўное, вада падаецца з р. Убарць. Ваганні ўзроўню вады на працягу года да 2,5 м. Выкарыстоўваецца для арашэння с.-г. угоддзяў, рыбагадоўлі.

СВІДО́ВЕЦ, Свідоўка, Балотніца, Плотніца, рака ў Жытомірскай вобл. Украіны і ў Гомельскай вобл. Беларусі, правы прыток р. Убарць (бас. р. Прыпяць). Даўж. 61 км, у межах Беларусі — 16 км. Пл. вадазбору 600 км^2. Пачынаецца за 6 км на ПнЗ ад в. Коўанка Алеўскага р-на Жытомірскай вобл., вусце каля в. Картынічы Лельчыцкага р-на (раней рака ўпадала ў р. Лохніца — прыток р. Убарць). Цячэ ў межах Палескай нізіны. Даліна амаль на ўсім працягу невыразная. Пойма ў верхнім і сярэднім цячэнні чаргуецца па берагах, у ніжнім — суцэльная, шыр. да 1,5 км, парасла лесам і хмызняком, месцамі адкрытая, лугавая, у асн. забалочаная. Рэчышча ў верхнім і сярэднім цячэнні слабазвілістае, шыр. 6—8 м, у ніжнім шыр. 15 м, на тэр. Беларусі каналізаванае. Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік меліярац. сістэм.

СВІДРАВА́ЛЬНЫ СТАНО́К, станок для *свідравання* адтулін у метал. і неметал. загатоўках.

Асн. характарыстыкі С.с. — найб. ўмоўны дыяметр свідравання, памеры конуса *шпіндэля*, вылет шпіндэля, найменшая і найб. адлегласць ад тарца шпіндэля да стала і да фундаментнай пліты. Тыпы універсальных С.с. у металаапрацоўцы: настольна-свідравальныя (аднашпіндэльныя), вертыкальна-свідравальныя (аднашпіндэльныя), радыяльна-свідравальныя, мнагашпіндэльныя, С.с. для глыбокага свідравання. Канструкцыі С.с. для дрэваапрацоўкі — свідравальна-пазавальныя і свідравальна-даўбёжныя (гл. *Даўбёжны станок*). Выкарыстоўваецца таксама для чыставой апрацоўкі (зенкеравання, разгортвання) адтулін, для наразання ўнутр. разьбы, для зенкавання паверхняў.

На Беларусі вертыкальна- і настольна-свідравальныя станкі вырабляе *Маладзечанскі станкабудаўнічы завод*.

СВІДРАВА́ННЕ, утварэнне скразной або глухой цыліндрычнай адтуліны ў дэталі або вырабе з драўніны, металу і інш.; від апрацоўкі матэрыялаў рэзаннем.

Робіцца свердлам на *свідравальных станках*, а таксама токарных, расточных і інш. станках ці ўручную — калаўротам, дрылём ці механізаваным інструментам (электрасвердлам, электрадрылём). Можа служыць падрыхтоўчай аперацыяй (з-за адносна невысокай дакладнасці) перад расточваннем, зенкераваннем (гл. *Зенкер*), рассвідроўваннем (гл. *Рассвідроўка*), працягваннем і наразаннем унутр. разьбы. Выкарыстоўваюць лазернае С. (гл. *Лазерная тэхналогія*) адтулін у алмазных кругах і інш. вырабах з матэрыялаў вял. трываласці і нізкай цеплаправоднасці.

СВІДРАВІ́НА, цыліндрычная *горная выработка* глыбінёй ад некалькіх метраў да 10 км і болей, дыяметрам звычайна 75—800 мм. Праходка С. ажыццяўляецца *бурэннем* з дапамогай спец. *буравых установак*. Гл. таксама *Буравая свідравіна*.

СВІДРО́ЎКА, рака ў Ляхавіцкім р-не Брэсцкай вобл., левы прыток р. *Шчара* (бас. р. Нёман). Даўж. 21 км. Пл. вадазбору 74 км^2. Пачынаецца за 1,5 км на ПнУ ад хутара Рачканы, месцамі цячэ сярод лесу, упадае ў р. Шчара за 1,5 км на Пд ад в. Меляхі. Рэчышча на працягу 7,2 км каналізаванае.

СВІДРЫГА́ЙЛА (у праваслаўі Леў, у каталіцтве Баляслаў; каля 1370 — 10.2.1452), вялікі князь ВКЛ у 1430—32. Сын вял. кн. *Альгерда* і яго 2-й жонкі, цвярской князёўны Юльяны, малодшы брат вял. кн. *Ягайлы*. У лют. 1386 перад каранацыяй Ягайлы польскаю каронаю ў Кракаве быў у складзе дэлегацыі ВКЛ і з праваслаўя перайшоў у каталіцтва. Атрымаў ад Ягайлы ва ўдзел Віцебскае княства. У 1393 *Вітаўт* пазбавіў С. віцебскага пасада. У 1396 С. накіраваўся па дапамогу да крыжакоў у Лівонію і з лівонскімі атрадамі заняў Віцебск. Вітаўт аблажыў і ўзяў горад, паланёнага С. адправілі ў Польшчу да Ягайлы. У складзе войска ВКЛ С. ўдзельнічаў у *бітве на Ворскле 1399*. У 1400 атрымаў княжанне ў Падоллі, прынёс прысягу Вітаўту. Аднак у 1402 уцёк у Прусію, каб з дапамогай крыжакоў узысці на велікакняжацкі трон у Вільні; удзельнічаў у паходах крыжакоў на Літву. Пасля прымірэння з Вітаўтам у 1407 атрымаў Северскае княства (сталіца Бранск). У 1408 разам з групай князёў і баяр ад'ехаў да вял. маскоўскага кн. Васіля I. У 1409 вярнуўся ў ВКЛ, вёў перагаворы з крыжакамі аб звяржэнні Вітаўта. Восенню 1409 схоплены слугамі Вітаўта і пасаджаны ў крэпасць Камянец. У сак. 1418 С. ўцёк у Венгрыю, пасля памірыўся з Ягайлам і Вітаўтам. У 1419 атрымаў ад апошняга ва ўдзел Чарнігаў, Ноўгарад-Северскі і Бранск. З гэтага часу ўдзельнічаў у паходах Вітаўта, вял. паліт. актыўнасці не праяўляў, аднак здабыў вял. аўтарытэт у правасл. баяр ВКЛ. Пасля смерці Вітаўта па дамоўленасці з Ягайлам на з'ездзе паноў і баяр ВКЛ у 1430 большасцю галасоў быў абраны вял. князем ВКЛ. Адразу адбыўся канфлікт паміж польскімі панамі і С., польскія войскі ўступілі ў Падолле і захапілі памежныя замкі. У 1431 С. заключыў саюз з Тэўтонскім ордэнам, Вял. Ноўгарадам і чэшскімі табарытамі з мэтай дасягнення поўнай незалежнасці ВКЛ ад польскага караля, ваенныя дзеянні працягваліся. Каб пашырыць сваю апору ў ВКЛ, С. даваў дзярж. пасады пераважна бел. правасл. баярам, што выклікала незадавальненне літ. баярства. 1.9.1431 было падпісана перамір'е з Польшчай на 2 гады, у выніку якога С. быў прызнаны Польшчай вял. князем і ўладаром усіх зямель ВКЛ. Вясной 1432 у адказ на спробы польскіх феадалаў навязаць ВКЛ новую унію С. фактычна разарваў саюзныя адносіны з Польшчай і пацвердзіў саюз з Тэўтонскім ордэнам. У ноч на 1.9.1432 адбыўся дзярж. пераварот, змоўшчыкі спрабавалі забіць вял. князя ў Ашмянах, але папярэджаны С. ўцёк у Полацк. Вял. князем у Вільні быў абраны *Жыгімонт Кейстутавіч*. Паміж С. і новым вял. князем пачалася феад. вайна (гл. *Свідрыгайлы паўстанне 1432—39*), у якой С. пацярпеў паражэнне. Кароль Польшчы Уладзіслаў III (пляменнік С.) выдзеліў яму невял. княства ў Пакуцці (на Пд Галіччыны). У 1440 вял. князь *Казімір IV* Ягелончык аддаў С. Валынскае княства, дзе С. панаваў да сваёй смерці.

Літ.: Грыцкевіч А. Свідрыгайла Леў // Скрыжалі «Спадчыны». Мн., 1996. Вып. 2.

А.П.Грыцкевіч.

СВІДРЫГА́ЙЛЫ ПАЎСТА́ННЕ 1432—39, прынятая ў гістарыяграфіі назва феад. вайны ў ВКЛ, у якую былі ўцягнуты ўсе пласты грамадства. Мела дынастычны характар барацьбы за дзярж. ўладу паміж 2 прадстаўнікамі дынастыі Гедзімінавічаў — *Свідрыгайлам* Альгердавічам і *Жыгімонтам Кейстутавічам*. Пасля абвяшчэння 1.9.1432 вял. князем Жыгімонта, якога падтрымала пераважна літ. арыстакратыя, скінуты з трона Свідрыгайла ўцёк у Полацк. Уладу Жыгімонта прызнала Жамойць, Літва і больш цесна з ёю звязаныя Брэсцкая і Мінская землі, прынёманскія воласці, Падляшша. Полацкая, Віцебская, Смаленская, Ноўгарад-Северская і Кіеўская землі, Валынь і Падолле падтрымалі Свідрыгайлу. Жыгімонт, не маючы дастатковых сіл, аднавіў дзярж. унію з Польшчай (15.10.1432 у Гродне). Яе ўмовы былі змешчаны ў акце Жыгімонта ад 15.10.1432 і акце Ягайлы ад 3.1.1433. Свідрыгайла атрымаў падтрымку ад вял. князя цвярскога, Лівонскага ордэна. У ліст. 1432 Свідрыгайла пачаў ваен. дзеянні. У жн. 1433 ён захапіў Коўна. Вяртаючыся назад, загадаў спаліць Заслаўе і Мінск. Восенню 1433 Жыгімонт спрабаваў авалодаць Мсціславам і Віцебскам, якія належалі Свідрыгайлу. Каб перацягнуць на свой бок жыхароў бел. і ўкр. зямель, Жыгімонт выдаў *прывілей 1434*, якім ураўнаваў асабістыя і маёмасныя правы правасл. баяр з правамі баяр-католікаў. У жн. 1435 войскі Свідрыгайлы і лівонскага магістра Ф.Керскорфа ўварваліся ў Літву з Браслава. 1.9.1435 на р. Швянтойі каля Вількаміра гэта войска разбіта войскам Жыгімонта; лівонскае войска амаль цалкам знішчана, забіты магістр. Вял. страты мела і войска Свідрыгайлы, а сам ён вярнуўся ў Полацк. Летам 1436 Полацк і Віцебск перайшлі на бок Жыгімонта, які пацвердзіў гэтым землям ранейшыя іх прывілеі. Замацаваўшыся ў ВКЛ, Жыгімонт пачаў праводзіць больш самаст. палітыку ў адносінах да Польшчы. Таму польскія феадалы цяпер пачалі падтрымліваць Свідрыгайлу. Супраць Жыгімонта выступіла і апазіцыя літ. знаці, незадаволеная рэпрэсіямі Жыгімонта і тым, што на дзярж. пасады ён прызначаў прадстаўнікоў дроб-

нага і сярэдняга бел. і літ. баярства. У жн. 1437 Свідрыгайла прапанаваў свайму пляменніку Уладзіславу III перадаць свае землі ў падпарадкаванне польскай кароне. Гэта паўплывала на пазіцыю баяр Кіеўскай і Валынскай зямель, якія не мелі намеру далучацца да Польшчы. Першае наступленне войска Жыгімонта на Кіеў было адбіта Свідрыгайлавым ваяводам Юршою, але пасля 2-га паходу Кіеў быў падпарадкаваны Жыгімонтам. Пад уладаю Свідрыгайлы засталіся Валынь і Падолле. Пасля ад'езду Свідрыгайлы ў Малдову, а потым у Пакуцце Валынь і Падолле прызналі ўладу Жыгімонта. Феадальная вайна скончылася.

А.П.Грыцкевіч.

СВІДУНО́ВІЧ Мікалай Аляксандравіч (н. 29.4.1940, в. Дзівін Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне металургіі. Д-р тэхн. н. (1980), праф. (1982). Скончыў БПІ (1962). З 1968 ў Бел. тэхнал. ун-це (з 1980 заг. кафедры). Навук. працы па даследаванні высокатэмпературных працэсаў у металургічнай вытв-сці. Распрацаваў тэхнал. асновы плазмафурменнага і дуплекс-плазменнага працэсаў у металургіі, новыя тэхналогіі выплаўкі зносаўстойлівых сталей і перапрацоўкі хромзмяшчальных адходаў.

Тв.: Взаимодействие компонентов в сплавах. М., 1989 (разам з В.П.Глыбіным, Л.К.Свірко); Плазмофурменный процесс. Мн., 1991.

Я.Г.Міляшкевіч.

СВІДЭ́РСКАЯ КУЛЬТУ́РА, археалагічная культура плямён, якія жылі на тэр. Польшчы і Беларусі (бас. рэк Віслы, Нёмана, Прыпяці) у сярэдзіне 9 — пач. 8-га тыс. да н.э. Назва ад помніка каля в. Свідры-Вельке (Польшча). У самастойную культуру вылучыў у 1923 польскі археолаг Л.Казлоўскі. Плямёны жылі ва ўмовах тундры. Асн. занятак насельніцтва — паляванне на паўн. аленя. Стаянкі кароткачасовыя адкрытага тыпу, жытлы круглаватыя, будана- і трапецападобныя, паглыбленыя ў зямлю, з вогнішчам пасярэдзіне. Інвентар — наканечнікі стрэл, скрабкі, разцы, скоблі, адна- і двухпляцовачныя нуклеусы. Большасць прылад выраблялі з пласцін. Насельніцтва С.к. стала генетычнай асновай сожскай (днепра-дзясніянскай), нёманскай, бутаўскай і кундскай мезалітычных культур лясной паласы еўрап. часткі былога СССР.

У.П.Ксяндзоў.

СВІДЭ́РСКІ (Świderski) Ян (14.1.1916, г. Хмяльнік Вінніцкай вобл., Украіна — 18.10.1988), польскі акцёр, рэжысёр. Праф. Вышэйшай тэатр. школы ў Варшаве (1948). Скончыў Ін-т тэатр. мастацтва ў Варшаве (1938). Дэбютаваў у 1938 у Познані. У 1944—49 працаваў у тэатрах Беластока, Любліна, Лодзі. З 1949 у Варшаве: з 1955 у «Т-ры Драматычным» (акцёр, рэжысёр, у 1962—65 маст. кіраўнік і адначасова дырэктар т-ра), з 1966 у «Т-ры Атэнэум». Акцёр шырокага творчага дыяпазону. Творчасці ўласцівы глыбокі псіхалагізм, вострая характарнасць, майстэрства пераўвасаблення. Сярод лепшых роляў: «Барон» («На дне» М.Горкага), Паэт («Вяселле» С.Выспянскага), Стары («Крэслы» Э.Іанескі), Ромул («Ромул Вялікі» Ф.Дзюрэнмата), Саламон («Цана» А.Мілера), Йун Габрыэль Боркман (аднайм. п'еса Г.Ібсена). Паставіў «Вяселле» Выспянскага (1955), «Паліцыя» С.Мрожака (1958). Пастаноўшчык і выканаўца роляў Шамбяляна («Дурны Якуб» Т.Рытнера, 1970), Фрыдрыха II («Фрыдрых Вялікі» А.Навачынскага, 1977). Здымаўся ў кіно. Дзярж. прэмія Польшчы 1964, 1976.

Літ.: Filler W. Jan Świderski. Warszawa, 1977.

СВІ́ЛА-1, гарадзішча жалезнага веку (6—8 ст.) і эпохі феадалізму (9 — пач. 10 ст.), каля в. Свіла 1-я Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Пляцоўка памерам 100 × 80 м умацавана 3 кальцавымі валамі і 2 равамі. Пры раскопках знойдзены наканечнікі стрэл, скроневыя кольцы, завушніца-лунніца, прасліцы, рэшткі глінянага посуду. На гарадзішчы выяўлены 2 грунтавыя пахаванні з абрадам трупаспалення. Знойдзеная ў гасп. яме вял. колькасць абпаленага азімага жыта з'яўляецца самым раннім сведчаннем (9 ст.) існавання гэтай культуры на Беларусі. Комплекс асн. рэчываў дае падставы меркаваць, што гарадзішча С.-1 заснавана балцкімі плямёнамі, а пазней ператворана крывічамі ў апорны пункт пры асваенні новых зямель у Падзвінні.

В.І.Шадыра.

СВІНА́, рака ў Гарадоцкім, Полацкім і Шумілінскім р-нах Віцебскай вобл., правы прыток р. *Обаль* (бас. р. Зах. Дзвіна). Даўж. 24 км. Пл. вадазбору 360 км^2. Выцякае з *Малога Белага возера* за 1,5 на ПнЗ ад в. Прудок Гарадоцкага р-на, цячэ праз воз. *Лясосна*, вусце за 1,5 км на ПнЗ ад в. Казьяны Шумілінскага р-на. Цячэ па паўн.-ўсх. частцы Полацкай нізіны, па лясістай мясцовасці. Прымае прытокі з 47 азёр.

СВІНАВО́Д, рака ў Лельчыцкім і Жыткавіцкім р-нах Гомельскай вобл., правы прыток р. Прыпяць. Даўж. 46 км. Пл. вадазбору 511 км^2. Пачынаецца за 4 км на Пн ад в. Данілевічы Лельчыцкага р-на, вусце за 1 км на Пн ад в. Пераройскі Млынок Жыткавіцкага р-на. Цячэ па ўсх. ч. нізіны Прыпяцкае Палессе. Даліна ў вярхоўі месцамі трапецападобная, вузкая, у сярэднім і ніжнім цячэнні невыразная. Пойма ў верхнім цячэнні перарывістая, у сярэднім цячэнні шыр. 300—800 м, у ніжнім — зліваецца з поймай Прыпяці. Рэчышча звілістае.

СВІНАГАДО́ЎЛЯ, галіна *жывёлагадоўлі*, развядзенне свіней на мяса, сала і інш. прадукты. Свініна — каштоўны харч. прадукт, са скуры свіней робяць абутак і інш. рэчы, з крыві — каўбасы, альбуміны, крывяную муку, са шчаціння — шчоткі і пэндзлі, з касцей — касцявую муку, кішкі ідуць у каўбасную вытв-сць і на выраб струн. Свінні рана дасягаюць палавой спеласці, ужо ў гадавым узросце могуць мець прыплод. Высокая пладавітасць (10—12 парасят за апарос) разам з кароткім эмбрыянальным перыядам даюць магчымасць атрымліваць ад кожнай свінаматкі да 2,5 т свініны ў жывой масе за год. Рэалізацыйнай жывой масы 100—120 кг свінні дасягаюць за 5—7 месяцаў пры сярэднясутачнай прывазе 600—800 г (а пры збалансаваных рацыёнах кармлення да 1000—1200 г) пры спажыванні на 1 кг прыбаўлення ў масе 3,5—4,5 кг у кармавых адзінках. Свінні маюць высокую забойную масу (да 75—85% ад жывой масы), у ёй да 52% мяса і да 32% падскурнага тлушчу. З мяса свіней гатуюць разнастайныя харч. прадукты, многія з якіх вытрымліваюць працяглае захоўванне. У мясным балансе Беларусі свініна складае 47,7% (2000).

Гадоўляй свіней людзі пачалі займацца ў неаліце (5—3-е тыс. да н.э.). У развітых антычных краінах (Егіпет, Грэцыя, Рым) ужо існавалі іх пароды. У краінах феад. Зах. Еўропы С. была прымітыўная. Яе развіццё звязана з ростам гарадоў і попыту на мяса. У 19 ст. пачалася інтэнсіўная праца па паляпшэнні мясц. і фарміраванні новых парод, у выніку з'явіліся высокапрадукцыйныя, многія з якіх (асабліва буйная белая, выведзеная ў Англіі) не страцілі значэння да нашага часу. Найб. развіццё С. атрымала ў Еўропе, Усх. Азіі, Паўн. і Паўд. Амерыцы. Амаль палова сусв. пагалоўя ў краінах Азіі (найб. Кітай, Японія, Індыя, В'етнам), каля 25% у Еўропе (Германія, Францыя, Італія, Вялікабрытанія, Расія, Украіна, Польшча) і каля 10% у ЗША. Па рэліг. матывах С. не атрымала развіцця ў мусульманскіх краінах. У сусв. гандлі свінінай гал. месца займаюць Нідэрланды, Бельгія, Данія, Кітай і Канада.

Да арт. **Свінагадоўля**. Свінагадоўчы комплекс у саўгасе-камбінаце «Сож» Гомельскага раёна.

На Беларусі да пач. 20 ст. С. была адной з развітых галін жывёлагадоўлі. Гадаваліся пераважна мясц. пароды, у памешчыцкіх гаспадарках — палепшаныя пароды. У 1916 было 2,4 млн. свіней. Племянная і таварная С. пачала развівацца ў 1920-я г. У час калектывізацыі ўзніклі таварныя свінагадоўчыя фермы (больш за 4 тыс. ў 1934). На пач. 1941 мелася 2,5 млн. свіней. З 1970-х г. С. пераводзілася на прамысл. аснову. Пабудаваны буйныя высокамеханізаваныя комплексы і ўкараněна паточна-цэхавая сістэма вытв-сці на фермах калгасаў і саўгасаў. На Беларусі (2000) 100 свінагадоўчых комплексаў і больш за 1 тыс. ферм трох тыпаў: з закончаным абаротам статка, рэпрадукцыйных і адкормачных. Буйныя комплексы на

108 тыс. галоў гадавога адкорму свіней і сярэднія на 54 тыс. галоў — у дзярж. уласнасці. Асн. пароды: буйная белая, чорна-белая, беларуская мясная, эстонская беконная, ландрас і інш. Племянную работу праводзяць спецыялізаваныя заводы, саўгасы, раённыя племянныя станцыі; навук. даследаванні — Бел. НДІ жывёлагадоўлі, лабараторыі пры ВНУ. Колькасць свіней 3,6 млн. галоў, у т.л. 1,3 млн. ў насельніцтва (2000). Эфектыўнасць С. апошнія гады паніжана ў сувязі з высокімі выдаткамі корму (каля 6,6 кг у кармавых адзінках на 1 кг прывагі, у т.л. каля 6 кг у кармавых адзінках канцэнтратаў). *Г.С.Смалякоў.*

СВІНАКРО́П, шпергель (Spergula), род кветкавых раслін сям. гваздзіковых. Каля 6 відаў. Пашыраны пераважна ва ўмераных і трапічных зонах Паўн. паўшар'я. На Беларусі 5 відаў С.: буйны

Свінакроп палявы.

(S.maxima), веснавы (S.vernalis), звычайны (S.vulgaris), ільняны (S.linicola), пасяўны (S.sativa). Трапляюцца ў хваёвых лясах, на ўзлесках, лугах, палях, агародах.

Аднагадовыя травяністыя расліны выш. 20—30 см. Сцёблы прамастойныя ці прыўзнятыя, галінастыя, як і лісце, залозіста-апушаныя. Лісце ніткападобнае, даўж. да 5 см, у несапраўдных кальчаках. Кветкі правільныя, дробныя, белыя, у паўпарасоніках. Плод — каробачка. Кармавыя расліны, часта пустазелле збожжавых і прапашных культур.

А.М.Скуратовіч.

СВІНА́РНІК, вытворчае памяшканне для ўтрымання *свіней* свойскіх. Асн. тыпы спецыялізаваных С.: матачнікі, адкормачнікі, памяшканні для рамонтнага маладняку, кныроў, халастых і парасных матак і інш.

Свінаматак трымаюць у індывід. або групавых станках (з разліку 1,9 м² на 1 галаву), у С.-адкормачніках — толькі ў групавых (з разліку 0,8 м² на 1 галаву). Паміж радамі станкоў размяшчаюць кармавыя, кармагноевыя праходы. Абсталяваны водаправодам, прыточнай выцяжной вентыляцыяй з падагрэвам паветра; маюць дапаможныя памяшканні: фуражная, вентыляцыйная, для прыгатавання кармоў, сталовая з кармацэхам, санблок, памяшканні для персаналу.

СВІНАЎЙСЬЦЕ (Świnoujście), горад на ПнЗ Польшчы, на а-вах Узнам і Волін у вусці р. Одра, у Заходне-Паморскім ваяводстве. Вядомы з 12 ст. Каля 60 тыс. ж. (2000). Порт на Балтыйскім м., аванпорт г. Шчэцін, паромная сувязь з Швецыяй. База рыбалоўства. Рыбаперапр. прам-сць. Прыморскі кліматычны і бальнеагразевы курорт. Музей марскога рыбалоўства.

СВІНГ (англ. swing узмах, раскалыханне), 1) асобны выразны сродак у *джазе*, тып метрарытмічнай пульсацыі, заснаваны на пастаянных адхіленнях ад апорных метрычных доляў, які стварае эфект няўстойлівай раўнавагі. 2) Стыль джаза ў выкананні *біг-бэнда*, дзе свабодная *імправізацыя* саступае месца ігры па натаваных *аранжыроўках*. Сярод прадстаўнікоў — Б.*Гудмен*, Г.*Мілер*, К.Бейсі.

СВІНЕ́Ц, плюмбум (лац. Plumbum), Pb, хімічны элемент IV групы перыяд. сістэмы, ат. н. 82, ат. м. 207,2. Прыродны складаецца з 5 стабільных ізатопаў: ^{202}Pb (сляды), ^{204}Pb (1,5%), ^{206}Pb (23,6%), ^{207}Pb (22,6%) і ^{208}Pb (52,3%). Ізатопы С. з масавымі лікамі 206—208 — канчатковыя прадукты натуральных *радыеактыўных радоў*. У зямной кары $1{,}6 \cdot 10^{-3}$% па масе. Найважн. мінерал — *галеніт* (гл. *Свінцовыя руды*). Вядомы са стараж. часоў. У 3—2-м тыс. да н.э. ў Месапатаміі і Егіпце са С. выраблялі статуі, пячаткі, прадметы хатняга ўжытку, таблічкі для пісьма. Старажытнаслав. назва С. — олово. Захавалася ў чэш. (Olovo), польскай (ołów), укр. (олово) і некат. інш. славянскіх мовах. У бел. мове назва С. — волава захоўвалася да сярэдзіны 20 ст. (адсюль назва «аловак»).

Мяккі пластычны цяжкі метал сіняваташэрага колеру, шчыльн. 11341,5 кг/м³ (20 °С), $t_{пл}$ 327,5 °С (адзін з легкаплаўкіх металаў), $t_{кіп}$ 1751 °С. Для С. характэрны *дыямагнетызм*, пры т-ры 7,19 К становіцца звышправаднікам. У паветры метал. С. набывае шэры колер, што абумоўлена ўтварэннем тонкай плёнкі аксіду PbO (гл. *Свінцу аксіды*), якая ахоўвае метал ад далейшага акіслення. Пры пакаёвай т-ры не ўзаемадзейнічае з разбаўленымі сернай і салянай к-тамі; растварацца ў разбаўленай азотнай і воцатнай к-тах, канцэнтраваных растворах шчолачаў. Атрымліваюць з сульфідных канцэнтратаў пасля іх агламерацыйнага абпалу з вапнай (гл. *Агламерацыя* ў металургіі) з наступнай плаўкай агламерату і рафінаваннем чарнавога металу. Выкарыстоўваюць для вырабу электродаў акумулятараў, абалонак эл. кабеляў, футравання хім. апаратаў, як матэрыял для аховы ад іанізавальных выпрамяненняў, кампанент друкарскіх і антыфрыкцыйных сплаваў (гл. *Свінцу сплавы*), паўправадніковых матэрыялаў. Атрутны; ГДК у атм. паветры 0,003 мг/м³, вадзе 0,03 мг/л. Асн. крыніцы забруджвання навакольнага асяроддзя С.: металургічныя прадпрыемствы, выхлапныя газы рухавікоў унутр. згарання.

Літ.: Козин Л.Ф., Морачевский А.Г. Физико-химия и металлургия высокочистого свинца. М., 1991. *Я.Г.Міляшкевіч.*

«СВІ́НКА», дзіцячая гульня на Беларусі. Колькасць удзельнікаў неабмежавана. Кожны гулец павінен мець кіёк. Каб вырашыць, каму выконваць ролю пастуха, праводзілася жараб'ёўка: па чарзе браліся за кіёк зверху над рукой папярэдняга, і каму выпала браццa за канец кійка апошнім, заставаўся «пастухом». Удзельнікі свабодна станавіліся кругам і выкопвалі насупраць сябе неглыбокую ямку, у якой на працягу гульні трымалі канец кійка. «Пастух» з дапамогай кійка «выганяў» (выкатваў) на «выган» (цэнтр круга) «С.» (невял. кавалак дрэва) і пачынаў яе «пасвіць» (падштурхоўваць то да аднаго, то да другога гульца). Гулец павінен быў хутка адагнаць яе ад сябе на «выган» (адкінуць кавалак дрэва ў цэнтр круга) і паставіць кіёк назад у ямку. «Пастух» таксама імкнуўся паставіць свой кіёк у свабодную ямку гульца, і калі яму ўдавалася, яны мяняліся ролямі. Дапамагчы гульцу адагнаць «С.» мог суседні гулец. Гульня вядома на Магілёўшчыне, Міншчыне і Віцебшчыне.

В.Дз.Ліцвінка.

СВІННЯ́ свойская, парнакапытная няжвачная жывёла сям. свіных. Паходзіць ад розных падвідаў дзіка (еўрап., азіяцкага). Прыручана ў 5—3-м тыс. да н.э. ва Усх. Азіі і некат. раёнах Еўропы (Міжземнамор'е, Прыбалтыка). У культ. парод захаваліся некат. біял. асаблівасці дзікіх продкаў — вострыя слых, тонкі нюх, слабы зрок, здольнасць добра плаваць; павялічыліся пладавітасць і здольнасці да хуткага росту і тлушчаадкладання. Пароды С. паводле кірункаў прадукцыйнасці падзяляюцца на групы: мясную, мяса-сальную і беконную.

Жывёла цяжкага, грубага целаскладу. Морда падоўжаная, з кароткім, рухомым хабаткам, які заканчваецца «пятачком». Зубоў 44, у т.л. 4 добра развітыя клыкі. Канечнасці чатырохпальцыя. Вымя мае 14 саскоў, размешчаных у 2 рады. Валасяное покрыва рэдкае, грубае, у асн. шчаціна. Страўнік просты. Усёедная. Жыве 15—20 гадоў, тэрмін прамысл. выкарыстання 2—3 (да 4) гады. Адрозніваецца пладавітасцю (за 2 гады 4—5 апаросаў па 8—12 парасят), скараспеласцю (жывая маса маладняку ў 6—7 мес да 100 кг), высокім забойным выхадам мясной прадукцыі (70—85%), эфектыўным выкарыстаннем кармоў. Гл. таксама *Свінагадоўля*.

СВІНО́, агульная назва злучаных паміж сабой азёр *Вялікае Свіно* і *Малое Свіно* ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл.

СВІНЎХА, свінушка, капытнік (Paxillus), род шапкавых грыбоў сям. свінухавых (капытнікавых). Пашыраны ў Еўразіі (10 відаў) і Паўн. Амерыцы. На Беларусі 4 віды С.: ніткаватая (P.filamentosus), панусападобная (P. panuoides), тонкая (P. involutus) і тоўстая (P. atrotomentosus). Трапляюцца з ліп. па

кастр. у лясах на глебе або гнілой драўніне.

Пладовае цела — шапка на ножцы. Шапка лейкападобная з падагнутым хвалістым краем, карычнева-бураватая. Пласцінкі выходныя. Мякаць на зломе цямнее. Ножка цыліндрычная, суцэльная. Споры эліпсоідныя, гладкія, вохрыстыя. Неядомая, мае ядавітыя рэчывы.

СВІ́НХУВУД (Svinhufvud) Пер Эвінд (15.12.1861, г. Сяксмякі, Фінляндыя — 29.2.1944), фінляндскі паліт. і дзярж. дзеяч. Юрыст. Уваходзіў у партыю *младафінаў*. З 1894 дэп. сейма, у 1907—12 яго старшыня. Выступаў за незалежнасць Фінляндыі ад Рас. імперыі, за што ў 1914 высланы рас. ўладамі ў Сібір (вярнуўся пасля Лют. рэвалюцыі 1917). З ліст. 1917 першы прэм'ер-міністр незалежнай Фінляндыі. У 1918 часовы кіраўнік дзяржавы. У ліп. 1930 — лют. 1931 прэм'ер-міністр (падтрымліваў нацыяналіст. лапуаскі рух; назва ад г. Лапуа), у 1931—37 прэзідэнт Фінляндыі. Пазней адышоў ад паліт. дзейнасці.

СВІНЦО́ВЫ БЛІШЧА́К, другая назва мінералу *галеніт*.

СВІНЦО́ВЫЯ РУ́ДЫ, састаўная частка *поліметалічных руд*, радзей утвараюць самаст. паклады. Вядома каля 180 мінералаў свінцу, прамысл. значэнне маюць сульфіды (*галеніт* — 86,6% свінцу), меншае — сульфасолі і карбанаты. Акісленыя руды складзены з цэрусіту (карбанат свінцу) і англезіту (сульфат свінцу). С.р. маюць цынк (мінералы *сфалерыт*, смітсаніт, каламін), серу, радзей медзь і барый, а таксама серабро, золата, кадмій, вісмут, сурму, ртуць, талій, германій і інш. Гал. радовішчы ў ЗША, Аўстраліі, Канадзе, Перу, Мексіцы. *У.Я.Бардон.*

Свінуха тонкая.

СВІНЦУ́ АКСІ́ДЫ, злучэнні *свінцу* з кіслародам. Найб. пашыраныя С.а.: аксід PbO, дыаксід PbO_2, ортаплюмбат (IV) свінцу (II) Pb_3O_4, ці свінцовы сурык.

Крышт. рэчывы, нерастваральныя ў вадзе. Аксід PbO існуе ў 2 крышт. мадыфікацыях — чырвонай (α-PbO, мінерал глёт) і жоўтай (β-PbO, мінерал масікот); т-ра паліморфнага ператварэння (α→β) 587 °С. Атрымліваюць PbO акісленнем расплаву свінцу кіслародам паветра, а таксама тэрмічным раскладаннем гідраксіду $Pb(OH)_2$) і карбанату ці нітрату свінцу (II). Выкарыстоўваюць у вытв-сці сурыку і інш. злучэнняў свінцу, свінцовых шкла (хрусталь, флантглас) і палівы. Дыаксід PbO_2 — рэчыва цёмна-рудога колеру. Моцны акісляльнік; пры расціранні з серай або чырвоным фосфарам загараецца. Атрымліваюць узаемадзеяннем Pb_3O_4 з канцэнтраванай азотнай к-той. Выкарыстоўваюць для запаўнення ячэек пласцін свінцовых акумулятараў, як акісляльнік (напр., кампанент галовак запалак). Свінцовы сурык Pb_3O_4 — рэчыва чырв. колеру, атрымліваюць пры награванні PbO да 400—500 °С у акісляльным асяроддзі. Выкарыстоўваюць як пігмент для антыкаразійных фарбаў і замазку ў свінцовых акумулятарах.

СВІНЦУ́ СПЛА́ВЫ, сплавы на аснове *свінцу*. Характарызуюцца нізкай (48—320 °С) т-рай плаўлення, невысокімі мех. трываласцю і цвёрдасцю, добрымі антыфрыкцыйнымі і тэхнал. ўласцівасцямі, высокай пластычнасцю, каразійнай устойлівасцю ў разбаўленых растворах кіслот. Асн. легіруючыя элементы С.с. — волава, сурма, медзь, вісмут, ртуць (гл. *Легіраванне*).

Паводле прызначэння С.с. падзяляюць на антыфрыкцыйныя (гл. *Бабіт*), друкарскія, прыпоі і легкаплаўкія. Друкарскія С.с. маюць да 20—23% сурмы, 1—4,5% мыш'яку, 5—7% волава, 1% медзі. Вызначаюцца цвёрдасцю, высокай вадкацякучасцю і невял. усадкай пры крышталізацыі. Захоўваюць пастаянны састаў пасля шматразовай пераплаўкі. Выкарыстоўваюць для адліўкі шрыфтоў ручнога і машыннага набору. *Прыпоі* на аснове С.с. маюць ад 1,3 да 51% легіруючых элементаў. Плавяцца пры 90—310 °С. Выкарыстоўваюць для нізкатэмпературнай пайкі жалеза, сталей, нікелю, медзі і яе сплаваў. Легкаплаўкія С.с. ($t_{пл}$ 48—96 °С) выкарыстоўваюць у электратэхніцы, сістэмах пажарнай сігналізацыі (плаўкія засцерагальнікі) і мед. тэхніцы. Пара С.с. атрутная.

СВІП-ГЕНЕРА́ТАР (ад англ. sweep бесперапынны рух), генератар хісткай частаты, тып *генератара вымяральнага*, на выхадзе якога частата эл. ваганняў аўтаматычна мяняецца паводле зададзенага закону. У спалучэнні з *асцылографам* дазваляе візуальна назіраць амплітудна- і фазачастотныя характарыстыкі радыётэхн. элементаў. Складаецца з задавальнага генератара, частотнага мадулятара, сістэмы аўтам. рэгулявання напружання (магутнасці) на выхадзе С.-г.; мае таксама рэзанансны частатамер (ці кварцавы калібратар) для атрымання частотных метак на экране асцылографа. Дыяпазон «хістання» частаты ў С.-г. дасягае актавы, выхадная магутнасць да 10 мВт.

СВІР, возера ў Мядзельскім р-не Мінскай вобл., у бас. р. Страча, за 27 км на ПдЗ ад г. Мядзел. Пл. 22,28 км², даўж. 14,1 км, найб. шыр. 2,3 км, найб. глыб. 8,7 м, даўж. берагавой лініі 31,2 км. Пл. вадазбору 364 км². Аб'ём вады 104,3 млн. м³. Катлавіна лагчыннага тыпу. Зах. схілы выш. 12—15 м (участкамі да 25 м), разараныя ці пад хмызняком, усходнія — выш. 3—5 м, параслі лесам. Пойма на У і Пн шыр. да 200 м, пад зрэджаным хмызняком, забалочаная, парэзаная сеткай меліярац. каналаў. Берагі высокія (да 0,7 м), месцамі зліваюцца са схіламі, усходнія — нізкія, забалочаныя. У цэнтры і на Пд пясчаныя мелі (2 і 3,4 м). Дно да глыб. 4 м пясчанае і пясчана-галечнае, глыбей сапрапелістае. Мінералізацыя вады да 260 мг/л, празрыстасць да 1 м. Эўтрофнае. Моцна зарастае ўздоўж усх. берагоў, у вытоку Свірыцы і месцы ўпадзення Смолкі паласа трыснягу і чароту дасягае шыр. 200 м. Упадаюць рэкі Смолка, Вял. Перакоп, некалькі ручаёў. На Пн выцякае р. Свірыца. Гідралаг. назіранні з 1965. Месца адпачынку, каля возера санаторый «Свір».

Возера **Свір**.

СВІР, гарадскі пасёлак у Мядзельскім р-не Мінскай вобл. За 45 км на З ад Мядзела, 180 км ад Мінска, 26 км ад чыг. ст. Лынтупы. Вузел аўтадарог на Смаргонь, Нарач, Брусы. 1,4 тыс. ж. (2000).

Засн., верагодна, у 13 ст. кн. *Даўмонтам*, які пабудаваў тут замак. Да 1528 мястэчка Ашмянскага пав. Віленскага ваяв. ВКЛ, уласнасць кн. *Свірскіх*, потым да 17 ст. Радзівілаў, пазней да 1820 зноў Свірскіх. З 1795 у Рас. імперыі, цэнтр воласці Завілейскага, потым Свянцянскага пав. Слонімскай, з 1801 Віленскай губ. У 1879 засн. бровар, у 1896 — спіртачышчальная вытв-сць. У 1897 у С. і 2 маёнтках 1686 ж., валасная ўправа, паштова-тэлеграфнае аддз., судова-следчы ўчастак Віленскага акр. суда, нар. вучылішча, касцёл, яўр. малітоўная школа, лячэбніца, аптэка, хлебазапасны магазін, 34 крамы, 12 заезных дамоў, 14 корчмаў, 5 кірмашоў на год. У 1921—39 у Польшчы, цэнтр гміны Свянцянскага пав. Віленскага ваяв. У 1931 — 1900 ж., гмінная ўправа, касцёл, царква, паліцэйскі ўчастак, гар. суд, аптэка, лячэбніца, пошта, на святы праводзіліся кірмашы. З 1939 у БССР, з 15.1.1940 цэнтр *Свірскага раёна* Вілейскай, з 20.9.1944 — Мала дзечанскай абл., з 12.10.1940 цэнтр сельсавета. 25.6.1941 акупіраваны ням. фашыстамі, якія за час вайны знішчылі ў С. 1920 чал. 6.7.1944 партызаны 16-й Смаленскай брыгады і атрада С.Р.Суслава вызвалілі С. і ўтрымлівалі яго да падыходу часцей Чырв. Арміі. З 25.4.1958 гар. пасёлак. З 31.8.1959 у Мядзельскім р-не, з 1960 у Мінскай вобл.

Працуюць спіртзавод, участкі Мядзельскага ВА жыллёва-камунальнай гаспадаркі, Нарачанскага рыбгаса; сярэдняя, муз. і спарт. школы, дашкольная ўстанова, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, паліклініка, аптэка, пункт быт. паслуг, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, помнікі землякам, што загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік археалогіі — гарадзішча. Помнікі архітэктуры: царква (мяжа 19—20 ст.), Мікалаеўскі касцёл (1908), сядзіба (пач. 20 ст.).

В.М.Князева.

Свіран у вёсцы Мяжаны Браслаўскага раёна Віцебскай вобл. Здымак пач. 20 ст.

Свіран у вёсцы Чамброва Навагрудскага раёна Гродзенскай вобл. Здымак пач. 20 ст.

СВІ́РАН, традыцыйная гасп. пабудова для захоўвання збожжа, прадуктаў, адзення, хатняга начыння. Здаўна вядомы на Беларусі, у Літве, асобных раёнах Польшчы. Ад *клецяў* адрозніваецца большымі памерамі, дыферэнцыраванасцю функцыян. прызначэння, дэкар. аздабленнем. Будавалі іх пераважна з дрэва, з 18 ст. вядомы мураваныя або ў тэхніцы «прускага муру». Некат. С. набліжаліся сваім выглядам да *лямусаў* і *скарбніц*. С. былі 1-яруснымі франтальнай кампазіцыі і 2-яруснымі франтальна-яруснай і цэнтрычна-яруснай кампазіцыі. У 17 ст. ўзнік тып шматкамернага С. франтальнай кампазіцыі — падоўжаны будынак, падзелены сценамі на самаст. памяшканні, кожнае з якіх мела ўваход з галерэі, утворанай *падчэнямі*. Часам галерэі мелі аркады, аздаблялі іх гіркамі і інш. дэкар. элементамі. Дахі ўпрыгожвалі метал. флюгерамі. У верхнім ярусе 2-яруснага С. рабілі галерэйку, на якую вяла з ганка адкрытая лесвіца. С. цэнтрычна-яруснай кампазіцыі мелі кругавыя галерэі ў абодвух ярусах. У некат. С. пад збожжа выкарыстоўвалі толькі ніжнія ярусы, а верхнія служылі скарбніцай. На Беларусі С. былі пашыраны да сярэдзіны 20 ст. *Ю.А.Якімовіч.*

СВІРА́НЫ, вёска ў Камайскім с/с Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса. За 27 км на ПдЗ ад горада і чыг. ст. Паставы, 277 км ад Віцебска. 207 ж., 95 двароў (2001). Клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СВІ́РКА (Świrko) Станіслаў (10.11.1911, в. Нёман Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл. — 16.8.1992), польскі гісторык л-ры і фальклярыстыкі, параміёлаг. Д-р н. габілітаваны (1980). Скончыў Варшаўскі ун-т (1952). У 1956—77 працаваў у Ін-це літ. даследаванняў Польскай АН. Даследаваў побыт, культ. сувязі бел. і польскага народаў, л-ру, фальклор эпохі рамантызму, параміялогію, грамадскую дзейнасць і паэзію філаматаў, творчасць Я.Чачота і А.Міцкевіча. Аўтар манаграфій «Новая кніга польскіх прыказак і прымавак» (т.1—4, 1969—78, у сааўт.), «З кола філамацкага перадрамантызму» (1972), «З Міцкевічам пад руку, або Жыццё і творчасць Яна Чачота» (1989), артыкулаў «Балады Чачота, іх сувязь з фальклорам і народнасцю Міцкевіча» (1958), «Аб месцы фальклору ў сучаснай польскай культуры» (1964), «Літва і Беларусь» (1970), «Ян Чачот як рэдактар і карэктар другога тома «Паэзія» А.Міцкевіча» (1972), «Творчасць зняволення Яна Чачота і яго сувязь з паэзіяй А.Міцкевіча» (1974) і інш. *А.С.Аксамітаў.*

Ю.Свірка.

СВІ́РКА Юрась (Юрый Мікалаевіч; н. 6.5.1933, в. Маргавіца Докшыцкага р-на Віцебскай вобл.), бел. паэт і перакладчык. Скончыў БДУ (1959). Працаваў у час. «Камуніст Беларусі», газ. «Чырвоная змена», «Літаратура і мастацтва», на Бел. радыё. Друкуецца з 1952. У першым зб. «Шэпчуцца ліўні» (1959) пераважна пейзажная лірыка. Аўтар зб-каў паэзіі «Вечнасць» (1963), «Баравіна» (1967), «Крэўнасць» (1971), «Аўтограф» (1974), «Люблю і веру» (1975), «Памятная вярста» (1978), «Біяграфія памяці» (1981), «Ядранасць» (1983), «Паўшар'е блакіту» (1986), «Узаемнасць» (1993, Літ. прэмія імя А.Куляшова 1993), у якіх малюнкі прыроды, жыццё і праца людзей, барацьба з ворагам у час Вял. Айч. вайны і інш. На бел. мову пераклаў паасобныя творы А.Пушкіна, Ф.Цютчава, А.Пракоф'ева, А.Твардоўскага, Р.Казаковай, Зульфіі, С.Нерыс, К.Сейтліева, О.Вацыеціса, Дз. Паўлычкі і інш. Песні на словы яго вершаў напісалі М.Аладаў, М.Наско, Ю.Семяняка і інш.

Тв.: Выбранае: Лірыка (1956—1990). Мн., 1993; Кружка з пясчаным дном. Мн., 1990.

Літ.: Л о й к а А. Сустрэчы з днём сённяшнім. Мн., 1968; Г н і л а м ё д а ў У. Ля аднаго вогнішча. Мн., 1984. *Л.М.Гарэлік.*

СВІ́РНАВАЯ МОЛЬ, з е р н е в а я м о л ь (Nemapogon granellus), матылёк сям. сапраўдных молей. Шкоднік зерня, сухафруктаў, кандытарскіх вырабаў і інш. Пашырана паўсюдна; у прыродзе сустракаецца ў гнілой драўніне і дрэвавых грыбах.

Крылы размаху 9—14 мм, пярэднія — серабрыста-шэрыя з цёмнымі плямамі, заднія — вузкія, шэрыя ці бураватыя. Матылькі 1-га пакалення паяўляюцца вясной, адкладваюць яйцы на зерне. Вусень даўж. да 10 мм, жаўтавата-белы, з карычневай ці бурай галавой. Кормяцца зернем, склейваюць яго павуцінай, утвараюць камякі. Зімуюць вусені ў коканах (у шчылінах падлогі і сцен).

СВІ́РНАВЫ ДАЎГАНО́СІК (Sitophilus granarius), жук сям. даўганосікаў. Шкоднік зерня (асабліва жыта, пшаніцы, рысу, ячменю) і збожжапрадуктаў, пераносчык мікраарганізмаў (фузарыума, буль-

бяной палачкі), якія выклікаюць самаўзгаранне і псаванне збожжавых запасаў. Пашыраны паўсюдна.

Цела даўж. 2,3—3,5 мм, бліскучае, цёмнакарычневае ці чорнае, з чырв.-бурымі нагамі і вусікамі. Не здольны да палёту (задняя крылы недаразвітыя). Самкі адкладваюць яйцы ў зерне. Лічынка даўж. да 3 мм, жаўтаватая, белая, бязногая, з карычневай галавой; развіваецца ў зерні, выгрызае большую яго ч. і там акукліваецца.

СВІ́РНАВЫЯ АГНЁЎКІ, матылькі сям. *агнёвак*. Шкоднікі зерня, насення, харч. прадуктаў і фуражу. Пашыраны паўсюдна, найб. млынавая, зерневая, паўд. свірнавая і мучная.

Крылы ў размаху 12—30 мм, пераважна шараватага колеру. Самкі адкладваюць яйцы на паверхню зерня. Вусені даўж. 12—20 мм, жаўтаватыя, зеленаватыя, ружаватыя ці інш., жывуць групамі ці адзіночна ў камяках ці трубачках, якія склейваюць з рэшткаў прадуктаў і павуціны.

СВІ́РНАВЫЯ КЛЯШЧЫ́, надсямейства кляшчоў сям. акарыд. Жывуць у глебе, гніючых расл. рэштках, актыўна размнажаюцца ў збожжасховішчах, сырах, скурах і інш., пераносчыкі спор цвёрдай галаўні пшаніцы і бульбяной палачкі. Зрэдку ў цяпліцах пашкоджваюць агуркі і інш. расліны. Пашыраны паўсюдна, найб. *мучны клешч*, валасаты звычайны, падоўжаны кляшчы.

Цела даўж. 0,2—0,5 мм, паўпразрыстае, шклопадобнае, з мяккім покрывам, доўгімі шчацінкамі. Ротавы апарат грызучы. Пры спрыяльных т-рах размнажаюцца бесперапынна круглы год. Большасць відаў утварае гіпопус — стадыю, неабходную для рассялення і перажывання неспрыяльных умоў асяроддзя.

СВІ́РНІШЧА, возера ў Мядзельскім р-не Мінскай вобл., у бас. р. Страча, за 36 км на З ад г.п. Мядзел. Пл. 0,38 км^2, даўж. 870 м, найб. шыр. 570 м, найб. глыб. 2,7 м, даўж. берагавой лініі 2,4 км. Пл. вадазбору 10 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу. Схілы выш. 4—5 м (на З і ПдЗ 20 м), параслі хмызняком, на З і У разараныя. Берагі сплавінныя, на У зліваюцца са схіламі. Дно плоскае, сапрапелістае. Зарастае падводнай расліннасцю, надводная расліннасць утварае паласу шыр. 5—50 м. Упадае меліярацыйная канава.



Свірнавыя кляшчы: 1 — звычайны валасаты; 2 — падоўжаны.

СВІРНО́ЎСКІ Аркадзь Іосіфавіч (н. 14.2.1938, Мінск), бел. вучоны ў галіне гематалогіі і радыебіялогіі. Д-р мед. н. (1979), праф. (1990). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1961), Мінскі ін-т замежных моў (1960). З 1961 у Бел. НДІ гематалогіі і пералівання крыві (з 1967 заг. лабараторыі). Навук. працы па біялогіі лейкемічнай клеткі, мадыфікацыі яе ўласцівасцей і пераадоленні множнай лекавай рэзістэнтнасці, рэакцыі крывятворнай сістэмы на дзеянне адмоўных (неспрыяльных) фактараў навакольнага асяроддзя, антылейкемічным і радыеахоўным дзеянні біял. фактараў.

Тв.: Hematological effects of Chernobyl in Belarus: do they really exist ten years later // Hematology. 1997. Vol. 2, № 4; Формирование лекарственной резистентности в опухолевых клетках: (экспериментально-теорет. анализ) (у сааўт.) // Вестн. фонда фундамент. исслед. 2000. № 4.

СВІ́РСКАЯ ГРАДА́. На крайнім ПнУ Гродзенскай і крайнім ПнЗ Мінскай абласцей. Уваходзіць у склад *Нарачана-Вілейскай нізіны*. Цягнецца з ПнЗ на ПдУ уздоўж паўд.-зах. берага воз. *Свір*. Даўж. каля 70 км, шыр. 0,5—4,5 км, выш. 165—185 м, найб. 210 м (на паўд.-ўсх. і ўсх. краі грады). Над прылеглымі ўчасткамі водна-ледавіковай і марэннай раўніны прыўзнята на 10—35 м, часам 50—60 м.

У тэктанічных адносінах С.г. прымеркавана да Вілейскага пахаванага выступу *Беларускай антэклізы*. Крышт. фундамент перакрыты чахлом магутнасцю каля 370 м, які складзены з парод верхняга пратэразою, кембрыю, ардовіку, сілуру, сярэдняга дэвону. У антрапагенавай тоўшчы пашыраны адклады дняпроўскага, сожскага і паазерскага зледзяненняў. Града створана паазерскім ледавіком.

Рэльеф узгорыста-западзінны. У аснове С.г. масіўны цоколь з марэнных супескаў з лінзамі і праслоямі пяскоў, на якім размешчаны збліжаныя адзін да

Свірнавая моль: 1 — дарослы матылёк; 2 — пашкоджанае зерне.

Свірнавы даўганосік: 1 — імага; 2 — яйцо, адкладзенае ў зерне; 3 — лічынка ў зерні; 4 — кукалка; 5 — знешні выгляд лічынкі; 6 — зерне, пашкоджанае жукамі.

Да арт. **Свірнавыя агнёўкі**. Млынавая агнёўка: 1 — імага; 2 — яйцы; 3 — лічынка; 4 — кукалка ў коканне з мукі. Мучная агнёўка: 5 — імага; 6 — яйцы; 7 — лічынка; 8 — кукалка.

аднаго марэнныя і камавыя ўзгоркі (адносная выш. 1—12, часам да 14—16 м), нярэдка падоўжаныя, выцягнутыя ў ланцугі. Паміж узгоркамі акруглыя западзіны, а паміж ланцугамі ўздоўж грады лагчынападобныя паглыбленні і водна-ледавіковыя лагчыны, па якіх цякуць р. Тушчанка і Струна. Абапал лагчын озы. Даліны р. Страча і яе прытока Свірыцы ў месцах перасячэння грады — вузкія, часта з абрывістымі схіламі. Глебы дзярнова-падзолістыя слаба- і сярэднеападзоленыя, у паніжэннях дзярнова-перагнойна-глеевыя і тарфяна-балотныя. Невял. ўчасткі хваёвых лясоў на паўн. і паўн.-ўсх. схілах. Па ўскраінах балот ельнікі, па берагах рэк чорнаалешнікі. Пад ворывам 30% тэрыторыі. На С.г. помнік прыроды рэсп. значэння — геал. агаленне *«Камарышкі»*.

Я.А.Ільін.

СВІ́РСКІ Аляксей Іванавіч (8.10.1865, С.-Пецярбург ці г. Жытомір, Украіна — 6.12.1942), рускі пісьменнік. Друкаваўся з 1892. У аповесцях «Злачынец» (1900), «Рыжык. Прыгоды маленькага бадзягі» (1901, экранізавана, 1960) з дэмакратычных пазіцый паказаны свет адрынутых — беспрытульнікаў, зняволеных, яўр. беднаты. Аповесці «Запіскі рабочага» (1906), «Чорныя людзі» (1908) пра рабочы клас. Аўтар зб-каў апавяданняў і нарысаў «Растоўскія трушчобы» (1893), «У сценах турмы» (1894), «На радзіме» (1902), «Яўрэйскія апавяданні», «Дзеці вуліцы» (абодва 1909), аўтабіягр. кн. «Гісторыя майго жыцця» (ч. 1—5, 1929—34, асобнае выд. 1940) і інш.

Тв.: Полн. собр. соч. Т. 1—10. М., 1928—30; История моей жизни. М., 1947; Рыжик: Повесть. Мн., 1997.

СВІ́РСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка БССР у 1940—59. Утвораны 15.1.1940 у Вілейскай вобл. Цэнтр — г.п. *Свір*. 12.10.1940 падзелены на 15 сельсаветаў. З 20.9.1944 у Маладзечанскай вобл. 31.8.1959 раён скасаваны, сельсаветы далучаны да Мядзельскага, Смаргонскага і Астравецкага р-наў.

СВІ́РСКІЯ, княжацкі род герба «Ліс» у ВКЛ. Першыя прадстаўнікі роду вядомы з дакументаў 1-й трэці 15 ст., валодалі маёнткамі Свір (адсюль прозвішча), Сырмеж, Споры, Мядзел, Варняны і інш. Андрэй С. падпісаў Кірстымонскі мірны дагавор 15.5.1432 вял. кн. Свідрыгайлы з Інфлянцкім ордэнам. Браты Эрык і Раман С. падпісалі акты Трокскай уніі 1433 і Гродзенскай уніі 1434, вядомы таксама іх брат (?) Івашка. Унукамі Эрыка былі: Андрэй Петкавіч (? — пасля 1503) — канонік віленскі, пробашч варнянскі, валодаў маёнткам Варняны; Якуб Петкавіч (? — да 1528) — харунжы свірскі; Марцін і Міхал Петкавічы (? — пасля 1503). Унук Івашкі Юхна прадаў у 1528 Ю.Радзівілу свой маёнтак разам з г. Свір і правам карыстання воз. Свір. Андрэй Юхнавіч (? — пасля 1533) прадаў у 1527 сваю частку Мядзела Гаштольду, астатнюю частку яму ж разам з братам Войцехам у 1533. Войцех Юхнавіч (?—1547) — харунжы крэўскі і свірскі (згадваецца з 1540). Унук Міхала Петкавіча Лукаш Баляслававіч (?— 1593) — пісар віленскага ваяводы М.Радзівіла Чорнага, дваранін гаспадарскі, маршалак гаспадарскі з 1565, староста крэўскі (згадваецца з 1569), цівун бяржанскі. Януш Баляслававіч (?—1597) — мастаўнічы полацкі (згадваецца з 1561), маршалак гаспадарскі (згадваецца з 1566), намеснік віленскі (згадваецца з 1588). Адзін з унукаў Марціна Петкавіча. Якуб Аляксандравіч (?—1585) — маршалак гаспадарскі з 1580. Гэтая лінія роду С. і лінія Міхала Петкавіча мелі працяг. *У.М.Вяроўкін-Шэлюта.*

СВІРЫ́ДАВІЧЫ, вёска ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 22 км на ПдУ ад горада і чыг. ст. Рэчыца, 55 км ад Гомеля. 429 ж., 171 двор (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

СВІРЫ́ДАЎ Алег Васілевіч (н. 18.3.1951, с. Воран-Лазоўка Хлевенскага р-на Ліпецкай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне біяарган. хіміі. Д-р хім. н. (1994). Скончыў Варонежскі ун-т (1972). З 1974 у Ін-це біяарган. хіміі Нац. АН Беларусі (з 2001 заг. лабараторыі і нам. дырэктара). Навук. працы па даследаванні фізіка-хім. уласцівасцей і біял. функцый гармонзвязваючых глікапратэінаў плазмы крыві і тканак чалавека, распрацоўцы імунадыягнастычных сродкаў і гарманальных лек. прэпаратаў. Дзярж. прэмія Беларусі 1988.

Тв.: О природе стероидсвязывающего центра транскортина человека (разам з А.А.Ахрэмам, А.А.Стральчонкам) // Докл. АН СССР. 1978. Т. 242, № 5; Новое свойство известных белков: специфич. связывание тиреоидных гормонов аполипопротеинами плазмы человека // Биохимия. 1994. Т. 59, вып. 5

СВІРЫ́ДАЎ Вадзім Васілевіч (9.4.1931, в. Вязынь Вілейскага р-на Мінскай вобл. — 13.4.2002), бел. хімік. Акад. Нац. АН Беларусі (1989, чл.-кар. 1980), д-р хім. н. (1973), праф. (1975). Засл. дз. нав. Беларусі (1976). Скончыў БДУ (1952), дзе і працуе з 1955 (з 1965 заг. кафедры), адначасова ў 1979—93 дырэктар НДІ фіз.-хім. праблем пры БДУ. Навук. працы па фотахіміі неарган. сістэм, хіміі фатагр. працэсаў, хіміі цвёрдага цела, праблемах выкладання хіміі. Устанавіў заканамернасці тэрмічнага раскладання, фатолізу і радыёлізу цвёрдых солей, заканамернасці фарміравання ультрадысперсных складаных аксідаў з сумесна асаджаных гідраксідаў металаў, умовы сінтэзу ў водным асяроддзі нанакрышт. металаў з рэгулюемым памерам часціц. Выявіў заканамернасці фарміравання нанаструктураваных і аморфных біметал. плёнак, у т.л. плёнак нераўнаважнага саставу, пры хім. і электрахім. асаджанні. Распрацаваў прынцыпы фотаселектыўнага асаджэння металаў з растворaў і асновы яго выкарыстання для нанясення метал. плёнак на экспанаваныя ўчасткі падложак.

Тв.: Фотохимия и радиационная химия твердых неорганических веществ. Ч 1. Мн., 1964; Химическое осаждение металлов из водных растворов. Мн., 1987 (у сааўт.); Неорганический синтез. 2 изд. Мн., 2000 (разам з Г.А.Папковіч, А.І.Васілеўскай).

СВІРЫ́ДАЎ Георгій (Юрый) Васілевіч (16.12.1915, г. Фацеж Курскай вобл., Расія — 6.1.1998), расійскі кампазітар, піяніст, муз.-грамадскі дзеяч. Нар. арт. СССР (1970). Герой Сац. Працы (1975).

В.В.Свірыдаў.

Г.В.Свірыдаў.

Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1941). Вучань П.Разанава, Дз.Шастаковіча. Значнае месца ў яго творчасці займалі жанры, звязаныя са словам; гал. тэма — Радзіма; яе лёс. Наследаваў і ўвасабляў традыцыі рус. пеўчай культуры, арганічна спалучаў яе з дасягненнямі мастацтва 20 ст. Музыка вызначаецца натуральнасцю, непаўторнасцю, рытмамі, уласцівымі жывой мове. Абнавіў жанры араторыі, кантаты, раманса, песні. Сярод твораў: муз. камедыі, у т.л. «Агеньчыкі» (1951), творы для голаса, хору і арк., у т.л. «Патэтычная араторыя» (словы У.Маякоўскага, 1959), «Курскія песні» (словы нар., 1964), арк. сюіта «Час, уперад!» (1965), «Мяцеліца» (муз. ілюстрацыі да аднайм. аповесці А.Пушкіна, 1974), сімфонія для струн. арк. (1940), музыка для камернага арк. (1964), трыо для скрыпкі, віяланчэлі і фп. (1945); фп. саната (1944), 2 партыты (1947), «Альбом п'ес для дзяцей» (1948); 3 хары з музыкі да драмы А.Талстога «Цар Фёдар Іаанавіч» (1973), для хору з суправаджэннем «Пушкінскі вянок» (1979) і інш., рамансы, песні; апрацоўка нар. песень, музыка да спектакляў драм. т-ра і кінафільмаў. Яго творчасць моцна паўплывала на развіццё рас. музыкі. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1968, 1980. Ленінская прэмія 1960.

Літ.: Сохор А.Н. Георгий Свиридов. М., 1964; Книга о Свиридове. М., 1983; Музыкальный мир Свиридова: Ст. Исслед. М., 1989.

Э.А.Алейнікава.

СВІРЫ́ДАЎ Уладзімір Пятровіч (7.12.1897, в. Казулічы Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. — 3.5.1963), генерал-лейтэнант артылерыі (1943). Скончыў ваен.

акадэміі імя Фрунзе (1930) і Генштаба (1938). У арміі з 1916, у Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік 1-й сусв. і грамадз. 1918—20 войнаў. З 1931 служыў у ваен. акругах. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Паўн., Ленінградскім, 2-м і 3-м Прыбалт. франтах: нач. артылерыі фронту, нам. камандуючага фронтам, камандуючы арміямі; удзельнік абароны і прарыву блакады Ленінграда, баёў пад Ноўгарадам, Псковам, у Прыбалтыцы. Да 1957 на камандных пасадах у Сав. Арміі. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1950—54. Адзін з аўтараў кн. «Бітва за Ленінград, 1941—1944» (1962).

А.І.Свірыдзёнак.

СВІРЫДЗЁНКА Георгій Уладзіміравіч (н. 3.12.1962), бел. спартсмен (гандбол). Засл. майстар спорту (1989). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1985). Чэмпіён XXIV Алімп. гульняў (1988, Сеул), чэмпіён свету сярод юніёраў (1983), прызёр чэмпіянату свету (серабро, 1990). З 1990 у Італіі (трэнер), з 1993 — у Германіі. У 1996 — трэнер каманды юніёраў Беларусі.

СВІРЫДЗЁНАК Анатоль Іванавіч (н. 7.7.1936, г. Орша Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне матэрыялазнаўства. Акад. Нац. АН Беларусі (1986, чл.-кар. 1984), д-р тэхн. н. (1976), праф. (1981). Скончыў Бел. ін-т інжынераў чыг. транспарту (1959). З 1959 у Ін-це механікі металапалімерных сістэм АН Беларусі (з 1967 заг. лабараторыі, з 1969 нам. дырэктара, з 1982 дырэктар). З 1990 дырэктар Аддзела праблем рэсурсазберажэння Нац. АН Беларусі. У 1987—92 чл. прэзідыума АН Беларусі. Навук. працы па матэрыялазнаўстве палімерных кампазітаў, тэорыі трэння і зносу цвёрдых цел, машынабуд. трыбоніцы, метадалогіі рэсурсазберажэння. Распрацаваў тэарэт. асновы стварэння фрыкцыйных матэрыялаў і канструкцый з палімераў і металапалімераў, правёў комплексныя даследаванні ўзаемасувязі іх структуры і ўласцівасцей. Прапанаваў метады кіравання структурай і фрыкцыйнымі ўласцівасцямі металапалімерных сістэм, метады і прыборы для даследавання паверхневых уласцівасцей палімераў і кампазітаў на іх аснове. Дзярж. прэмія Беларусі 1972.

Тв.: Трение и износ материалов на основе полимеров. Мн., 1976 (у сааўт.); Акустические и электрические методы в триботехнике. Мн., 1987 (у сааўт.); Материаловедение и конструкционные материалы. Мн., 1989 (у сааўт.).

СВІРЭ́ПА (Barbarea), род кветкавых раслін сям. крыжакветных. Каля 20 відаў. Пашыраны ва ўмеранай зоне Паўн. паўшар'я, як заносныя — паўсюдна ў нетрапічных краінах. На Беларусі 2 віды С.: звычайная (B. vulgaris) і прамая (B. stricta). Трапляюцца на вільготных лугах, па берагах рэк, на палях, у пасевах.

Двух- або шматгадовыя травяністыя расліны выш. да 100 см. Сцёблы прамастойныя, галінастыя. Ніжняе лісце ліравападобнае, верхняе суцэльнае. Кветкі жоўтыя. Плод — стручок. Насенне ядавітае для свойскай жывёлы і птушак. Зімовы крэс (B. verna) культывуюць у Зах. Еўропе як салату. Харч., тэхн., меданосныя расліны, часта — пустазелле. *А.М.Скуратовіч.*

СВІРЭ́ПАВЫ АЛЕ́Й, тлусты алей, які атрымліваюць прасаваннем насення *свірэпіцы*. Вадкасць зеленавата-бурага колеру, шчыльн. 918 кг/м^3, т-ра застывання -8 °С. Не раствараецца ў вадзе, метаноле і этаноле. Паўвысыхальны алей; мае значную колькасць (31—47% па масе) трыгліцэрыдаў ненасычанай эрукавай к-ты ($C_{21}H_{41}COOH$). Выкарыстоўваюць як сыравіну ў вытв-сці пакостаў, алкідных смол, мыла, кампанент змазачных матэрыялаў; рафінаваны С.а. — харч. прадукт. Гл. таксама *Алеі*.

СВІРЭ́ПІЦА, капуста палявая (Brassica campestris), кветкавая расліна сям. крыжакветных. Пашырана ў Еўразіі, у Паўн. Афрыцы, Амерыцы і Аўстраліі — заносная. Вырошчваецца як алейная культура. На Беларусі трапляецца на палях, агародах, уздоўж дарог, на сметніках.

Аднагадовая расліна выш. да 100 см. Сцёблы прамыя, галінастыя. Прыкаранёвае лісце простае, ліравападобна-перыстае, апушанае, сцябловае — голае, суцэльнае, сядзячае. Кветкі жоўтыя. Плод — стручок. Насенне мае да 45% *свірэпавага алею*. Маладое лісце спажываюць як салату. Алейная, харч., меданосная, кармавая, рудэральная расліна. *А.М.Скуратовіч.*

СВІ́СЛАЦКАЕ КНЯ́СТВА, удзельнае княства ў складзе ВКЛ на р. Бярэзіна ў 14 ст. Цэнтр — в. *Свіслач* (цяпер Асіповіцкі р-н Магілёўскай вобл.). Адзіны вядомы князь Сямён Свіслацкі ўпамінаецца ў летапісах пад 1349, калі быў пасланы вял. кн. Альгердам разам з князямі Міхаілам, Карыятам і Айкшой у пасольства да татар. Некат. гісторыкі атаясамлівалі Сямёна Свіслацкага з Сямёнам, сынам вял. кн. Яўнута (гл. ў арт. *Заслаўскія*) або з Сямёнам Ямантовічам (гл. ў арт. *Ямантовічы*). У 1387 вял. кн. Ягайла перадаў Свіслацкую воласць разам з іншымі землямі ў пажыццёвае ўладанне Скіргайлу. Пасля Свіслач — дзярж. ўладанне. *В.С.Пазднякоў.*

СВІ́СЛАЦКАЯ БЕЛАРУ́СКАЯ НАСТА́ЎНІЦКАЯ СЕМІНА́РЫЯ. Існавала ў 1916—18. Засн. ў 1916 (заняткі пачаліся 15.10.1916) у мяст. Свіслач Ваўкавыскага пав. Рыхтавала настаўнікаў для бел. пач. школ зах. Беларусі, акупіраванай войскамі Германіі. Паводле статуса ў семінарыю павінны былі прымацца асобы абодвух полаў і рознага веравызнання, якія скончылі 4 класы гімназіі або гар. ці вышэйшага пач. вучылішча (фактычна прымаліся і з меншым адукац. цэнзам). Навучанне вялося на бел. мове, тэрмін — 3—4 месяцы. Дазвалялася здаць курс навучання экстэрнам. Выкладаліся: бел. мова і л-ра, ням. мова, рэлігія, педагогіка, арыфметыка, асновы геаграфіі, гісторыя Беларусі, гімнастыка, спевы, маляванне, гігіена, садоўніцтва і агародніцтва, ручная

Свірэпа звычайная.

Свірэпіца палявая.

праца. У 1917 у семінарыі чытаў лекцыі па гісторыі бел. л-ры праф. Брэслаўскага (Вроцлаўскага) ун-та Р. Абіхт, сярод выкладчыкаў Б.Пачопка (паводле лекцый у 1918 выдаў лацінкай у Вільні «Граматыку беларускай мовы»). У семінарыі вучыліся А.Грыкоўскі, В.Мурашка (Маслоўская), У.Шалешка. Закрыта 15.11.1918. *У.В.Ляхоўскі.*

СВІ́СЛАЦКАЯ ВО́ЛАСЦЬ, буйны дзярж. маёнтак у ВКЛ у нізоўі р. Свіслач (прыток Бярэзіны) у 14—18 ст. Першапачаткова ўяўляла сабой, напэўна, цэнтр. частку *Свіслацкага княства*, далучанага да ВКЛ у сярэдзіне 14 ст. У 15 ст., верагодна, мела двайное падпарадкаванне Віленскаму і Трокскаму ваяв. У 1-й пал. 16 ст. ўваходзіла ў Віленскае ваяв. У 1560 у С.в., як і ў інш. дзярж. маёнтках, праведзена зямельная рэформа, уведзена новая адзінка абкладання — *служба*. Паводле інвентара, складзенага з гэтай нагоды, у воласці (акрамя мястэчка і замка Свіслач) было 18 сёл з 484 дварамі, у якіх намерана 137 службаў. Паводле адм. рэформы 1565—66 тэр. С.в. на З ад р. Бярэзіна ўключана ў Мінскі пав., рэшта — у Аршанскі пав. У 1568 свіслацкі намеснік М.Б.Гарабурда атрымаў ад вял. кн. ВКЛ Жыгімонта II Аўгуста прывілей на падараванне яму воласці, якая засталася за яго нашчадкамі як прыватны маёнтак. *В.Л.Насевіч.*

СВІ́СЛАЦКАЯ НАСТА́ЎНІЦКАЯ СЕМІНА́РЫЯ. Існавала ў 1876—1921 у мяст. Свіслач Гродзенскай губ. як агульнаадукацыйная сярэдняя навуч. ўстанова з пед. ухілам. Засн. 21.9.1876 на месцы 4-класнай прагімназіі. Рыхтавала настаўнікаў для пач. нар. вучылішчаў пераважна для Віленскай навуч. акругі, у склад якой уваходзіла. Утрымлівалася за кошт казны і збораў за навучанне. З губернскага фонду на спец. земскія стыпендыі штогод выдзялялася 2 тыс. руб. Напачатку мела 3 класы. У 1907 рэарганізавана — асн. курс падзелены на 4 класы, адкрыты падрыхтоўчы клас і ўзорнае пач. вучылішча, у якім семінарысты праходзілі практыку. Прымаліся асобы з усіх саслоўяў, якія дасягнулі 16-гадовага ўзросту і мелі дыплом пра заканчэнне нар. пач. вучылішча. Паступаць у ВНУ Рас. імперыі выпускнікі не мелі права. У 1911 у семінарыі навучалася 204, у 1915—207 выхаванцаў. Яе ўзначальваў дырэктар, працавалі законанастаўнік, 6 выкладчыкаў, урач і фельчар. Заняткі вялі выпускнікі рас. ун-таў, духоўных акадэмій, Бельскай настаўніцкай семінарыі, Віленскага настаўніцкага ін-та, уласныя выхаванцы. Выкладаліся: Закон Божы, асновы педагогікі, рус. і царк.-слав. мовы, матэматыка, фізіка, каморніцтва, геаметрыя, гісторыя, геаграфія, чарчэнне, прыродазнаўства, чыстапісанне, спевы, гімнастыка, рамёствы, маляванне, агародніцтва і садоўніцтва. Летам 1915 семінарыя эвакуіравана ў г. Мядынь Калужскай губ. (Расія). *А.Ф.Самусік.*

СВІ́СЛАЦКІ ГІСТО́РЫКА-КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Засн. ў 1976, адкрыты ў 1979 у г.п. *Свіслач* Гродзенскай вобл. Пл. экспазіцыі 189 м², больш за 6 тыс. экспанатаў асн. фонду (2000). Сярод экспанатаў кавалкі балотнай руды, каменныя прылады працы эпохі мезаліту, фотаздымкі і матэрыялы пра ўладальніка мяст. Свіслач В.Тышкевіча, у т.л. макет тэатра; пра гісторыю свіслацкіх гімназіі і семінарыі, падзей часоў паўстання 1863—64, буд-ва чыгункі, 1-й сусв. вайны, Свіслаччыны пач. 20 ст., пра дзейнасць Т-ва бел. школы, КПЗБ, падзеі Вял. Айч. вайны, арганізатараў і кіраўнікоў падполля і партыз. руху, дыярама «Партызанская засада», матэрыялы пра аднаўленне і развіццё нар. гаспадаркі, аховы здароўя, культуры і спорту ў пасляваенны час, жывёльны і раслінны свет раёна. *Н.У.Пакутнік.*



Аўтар В.Л.Насевіч

СВІ́СЛАЦКІ ЗА́МАК. Існаваў у 12—17 ст. каля в. *Свіслач* (цяпер Асіповіцкі р-н Магілёўскай вобл.). Гарадзішча «Замак», звязанае з гісторыяй мяст. Свіслач і Свіслацкага княства (14 ст.), размяшчалася на мысе правага берага р. Бярэзіна, у якую справа ўпадае р. Свіслач. У сярэдзіне 17 ст. замкавая пляцоўка мела форму прамавугольніка (72,8 × 63,5 м), была аддзелена ад астатняга плато шырокім (каля 15 м) дугападобным ровам і ўмацавана па краі земляным валам. Над узроўнем вады ў Свіслачы замчышча ўзвышалася на 12 м. У 1-й пал. 13 ст. замак быў спалены. Потым яго разам з горадам разбурылі ў 1506 крымскія татары і ў 1535 — рус. войскі. Ужо ў 1501 С.з. меў агнястрэльную зброю, у т.л. гарматы. Паводле плана С.з. (1647), зробленага ўладальнікам Свіслачы кн. Багуславам Радзівілам, у драўляным замку меліся 3 вежы, у т.л. ўязная брама, і 2 участкі сцен-гародняў даўж. 39 м і 35,8 м. На самым мысе С.з. размешчана пабудова ў форме прамавугольніка (верагодна, дом адміністратара). На 2-м плане Радзівіла акрамя замка пазначаны і ўчастак тэрыторыі паміж Бярэзінай і Свіслаччу. У месцы найб. блізкага працякання іх адна каля адной знаходзіліся земляны вал з брамай на ім і абарончы роў, які запаўняўся водамі рэк. Другая размяшчалася з боку моста цераз р. Свіслач. У час антыфеад. вайны 1648—51 паўстанцкі атрад палк. Г.Бута колькасцю каля 1 тыс. чал. заняў у 1648 Свіслач. У вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 без вял. намаганняў «Иван Золоторенко город Свислочь взял... в сентябре 1654 г.». З таго часу ў дакументах звесткі пра С.з. больш не сустракаюцца. *М.А.Ткачоў.*


Свіслацкі замак. Агульны выгляд у сярэдзіне 17 ст. Рэканструкцыя С.А.Сергачова.

СВІ́СЛАЦКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1924—31. Цэнтр — в. *Свіслач*. Утвораны 17.7.1924 у Бабруйскай акр. (да 26.7.1930). 20.8.1924 падзелены на 9 сельсаветаў. 8.7.1931 раён скасаваны, сельсаветы перададзены Клічаўскаму і Асіповіцкаму р-нам.

СВІ́СЛАЦКІ РАЁН. Размешчаны на ПдЗ Гродзенскай вобл. Утвораны 15.1.1940. Пл. 1,4 тыс. км². Нас. 25,2 тыс. чал. (2001), гарадскога 36,5%. Сярэдняя шчыльн. 18 чал. на 1 км². Цэнтр — г. *Свіслач*. Уключае г.п. *Поразава*, 151 сельскі нас. пункт, Поразаўскі пасялковы Савет, 6 сельсаветаў: Вердаміцкі, Дабравольскі, Навадворскі, Нязбодзіцкі, Свіслацкі, Ханявіцкі.

Тэр. раёна знаходзіцца пераважна ў межах *Прыбугскай раўніны*, на ПнУ — *Ваўкавыскага ўзвышша*. Паверхня ўзгорыста-раўнінная, пашыраны лагчыны сцёку ледавіковых вод і скразныя даліны. Цэнтр. ч. раёна — водападзел паміж басейнамі рэк Нёман і Нараў. Пераважаюць выш. 160—200 м (95%), найвыш. пункт 242 м (за 5 км на З ад г.п. Поразава). Глыбіня расчляянення рэльефу ў межах узвышша — 20 м/км². Карысныя выкапні: пяскчана-жвіровы матэрыял, буд. пяскі, гліны і суглінкі, торф. Сярэдняя т-ра студз. -5 °С, ліп. 18 °С. Ападкаў 585 мм за год. Вегетац. перыяд 199 сут. Найб. рэкі Нараў з Калонкай і Рудаўкай, Рось з Харужаўкай, Свіслач, Зальвянка. Пераважаюць глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (68,3%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (14,5%). Пад лесам 48,8% тэр. раёна. Найб. лясістасць на Пд раёна, на ПдЗ амаль палавіна лясного масіву *Белавежская пушча*. Пераважаюць лясы хваёвыя, яловыя, бярозавыя, чорнаальховыя, дубовыя; трапляюцца грабавыя, асінавыя, ясянёвыя і інш. Пад балотамі 6,2% тэрыторыі. Найб. балотныя масівы Зальвянка і Глыбокае

балота. На тэр. раёна ч. нац. парку *Белавежская пушча*, гідралагічны заказнік рэсп. значэння — *Дзікае* (часткова); заказнік мясц. значэння — біялагічны Поразаўскі. Помнікі прыроды рэсп. значэння: парк «Вердамічы» ў в. Вердамічы.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 55,5 тыс. га, з іх асушаных 12,5 тыс. га. На 1.1.2001 у раёне 9 калгасаў, 6 саўгасаў, 14 фермерскіх гаспадарак. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, вырошчванні збожжавых і кармавых культур, лёнудаўгунцу, бульбы. Прадпрыемствы кааператыўнай (каўбасныя, хлебабулачныя і макаронныя вырабы) і мэблевай (мэбля з лазы) прам-сці. Па тэр. раёна праходзіць чыгунка Гайнаўка (Польшча) — Свіслач—Ваўкавыск, аўтадарогамі г. Свіслач звязаны з гарадамі Гродна, Ваўкавыск, г.п. Поразава. У раёне 16 сярэдніх, 7 базавых, 1 пач., 1 муз., 1 спарт., 2 маст. школы, спецшкола-інтэрнат, Цэнтр пазашкольнай працы, 15 дашкольных устаноў, 24 дамы культуры і клубы, 37 б-к, 2 бальніцы, 2 паліклінікі,

5 амбулаторый, 16 фельч.-ак. пунктаў. Раённы гіст.-краязнаўчы музей. Помнікі архітэктуры: сядзібны дом (19 ст.) у в. Гарнастаевічы, царква (пабудавана ў 1792 як касцёл францысканцаў, з 1870 правасл. царква, захаваліся фрагменты мураванай агароджы і брама 18 ст.) у в. Грынявічы, царква Іаана Хрысціцеля (1840) у в. Дабраволя. Выдаецца «Свіслацкая газета». *Р.Р.Паўлавец, Т.І.Шмыга.*

СВІ́СЛАЧ, рака ў Мінскай і Магілёўскай абл., правы прыток р. Бярэзіна (бас. р. Дняпро). Даўж. 285 км, пл. вадазбору 5,2 тыс. км². Пачынаецца на Мінскім узв. за 1,5 км на ПдУ ад в. Шапавалы Валожынскага р-на Мінскай вобл., вусце на паўд.-ўсх. ускраіне в. Свіслач Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл. Цячэ па цэнтр. ч. Мінскага ўзв. і па зах. ускраіне Цэнтральнабярэзінскай раўніны. Асн. прытокі: Вяча (упадае ў *Заслаўскае вадасховішча*), Волма, Балачанка (злева), Цітаўка, Талька, Сіняя (справа). Даліна ў вытокавай частцы V-падобная і скрынепадобная, у сярэднім цячэнні пераважна трапецападобная, у нізнім — невыразная або трапецападобная, шыр. ў вярхоўі 400—600 м, у сярэднім і ніжнім цячэнні 1—2 км. Схілы ў верхнім і сярэднім цячэнні ўмерана стромкія, радзей спадзістыя, выш. 10—12 м, парэзаныя далінамі прытокаў. Пойма двухбаковая, радзей аднабаковая, чаргуецца па берагах, парэзаная старыцамі і меліярац. каналамі, пераважна адкрытая, шыр. 300—500 м у верхнім, 0,8—1 км у ніжнім цячэнні. Рэчышча ад вытоку на працягу 4 км звілістае, месцамі каналізаванае, шыр. 3—4 м. У вярхоўі ад в. Векшыцы Мінскага р-на на працягу амаль 10 км з'яўляецца часткай канала *Вілейска-Мінскай воднай сістэмы*. У межах г. Мінска рэчышча шыр. 25—30 м, утварае 8 лукавін, каналізавана на 7 участках агульнай працягласцю 7,9 км (да в. Каралішчавічы Мінскага р-на). У цэнтры горада берагі забетанаваны, добраўпарадкаваны. У сярэднім і ніжнім цячэнні рэчышча меандруе, глыбокаўрэзанае, звілістае, шыр. 25—50 м; берагі выш. 2—3 м, месцамі 6—8 м. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Да буд-ва Вілейска-Мінскай воднай сістэмы веснавое разводдзе пачыналася ў 2-й пал. сак., доўжылася 50 сут, найвыш. ўзроўні ўсталёўваліся ў сярэдзіне мая, найніжэйшыя — у ліп. і жн.; замярзала ў сярэдзіне снеж., крыгалом у 2-й пал. сакавіка. Сяроднегадавы расход вады ў вусці каля 45—50 м³/с. Прыродны рэжым ракі зарэгуляваны каскадам вадасх. (Заслаўскае, Крыніца, Дразды, Камсамольскае возера, Чыжоўскае, Асіповіцкае). На сцёк С. ўплывае таксама перакідка вады з р. Вілія па Вілейска-Мінскай воднай сістэме. З вадасх. Дразды частка сцёку паступае ў *Сляпянскую водную сістэму*. У Мінску і ніжэй рака моцна забруджана прамысл. і быт. сцёкамі. На С. — Асіповіцкая ГЭС, гарады Мінск, Заслаўе.

А.А.Макарэвіч.

СВІ́СЛАЧ, рака ў Гродзенскай вобл. і на мяжы з Польшчай, левы прыток р. Нёман. Даўж. 121 км, пл. вадазбору 1800 км², у тл. ў межах Беларусі 1432 км². Пачынаецца каля в. Занкі 1-я Свіслацкага р-на, вусце за 1,2 км на Пн ад г.п. Свіслач. Цячэ па ўсх. схілах Гродзенскага і зах. схілах Ваўкавыскага ўзв., у ніжнім цячэнні — па Нёманскай нізіне. Асн. прытокі: Рудаўка, Куклянка, Бераставічанка, Верацейка, Пікелка (справа), Істачанка, Нятупа, Уснарка, Одла, Індурка, Лашанка (злева). Даліна ў верхнім і ніжнім цячэнні трапецападобная, шыр. 0,8—2 км, у сярэднім цячэнні невыразная. Схілы спадзістыя, умерана стромкія, выш. 10—25 м, парэзаныя далінамі прытокаў і ярамі. Пойма двухбаковая, шыр. 300—500 м, роўная, у сярэднім цячэнні невыразная, пераважна забалочаная. У разводдзе затапляецца на глыб. да 1,6 м на 10—12 сут (шыр. разліву да 5 км). Рэчышча на працягу 30,6 км каналізаванае, на астатнім працягу звілістае, неразгалінаванае, у верхнім цячэнні шыр. 3—6 м, ніжэй 10—35 м, месцамі да 60 м. Берагі ўмерана стромкія і стромкія, у ніжнім цячэнні абрывістыя. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Рака вызначаецца выразным веснавым разводдзем, адносна нізкай летне-асенняй і зімовай межанню, перыядычнымі летне-асеннімі паводкамі. На перыяд веснавога разводдзя прыпадае да 40% гадавога сцёку. Найвыш. ўзровень разводдзя ў сярэдзіне сак., сярэдняя выш. над межанным узроўнем у ніжнім цячэнні 2,9 м, найб. 5,8 м. Дажджавыя паводкі ў перыяд межані амаль штогод. Замярзае ў канцы снеж., крыгалом у сярэдзіне сакавіка. Веснавы крыгаход 8 сут. Сяроднегадавы расход вады ў вусці 9 м³/с. Рака зарэгулявана плацінамі. У даліне р. Верацейка наліўное вадасх. Дублянскае. Каля вытоку С. — г.п. Свіслач.

А.А.Макарэвіч.

СВІ́СЛАЧ, гарадзішча *штрыхаванай керамікі культуры* і эпохі Кіеўскай Русі на ўскраіне в. *Свіслач* Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл. Пры даследаванні ў ніжнім гарызонце знойдзены рэчы жал. веку (6 ст. да н.э. — 1 ст. н. э.) — жал. шпілька з S-падобным завітком, нож, шлакі, каменная зерняцёрка, фрагменты штрыхаванай керамікі. У верхнім выяўлены сляды наземных драўляных пабудоў з дашчанай падлогай і рэшткі печаў, складзеных з камення з гліняными чарэнямі часоў сярэдневякоўя. Знойдзены сякеры, нажы, долата, замкі з ключамі, іголкі, шылы, праколкі, шыферныя прасліцы, крэсівы, каса-гарбуша, матыка, сашнікі, восці, гарпуны, зброя і рыштунак конніка, вырабы з рогу і косці, бронзавыя ювелірныя вырабы (крыж-складзень, створкі энкалпіёна, пласціністы бранзалет, кавалкі бронзавай або меднай пасудзіны), шкляныя вырабы (бранзалеты, пацеркі, пярсцёнкі, фрагменты посуду), фрагменты амфар і інш. На думку даследчыкаў, С. у гэты час была раннефеад. замкам.

СВІ́СЛАЧ, горад, цэнтр Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл., каля вытоку р. Свіслач (бас. р. Нёман); чыг. ст. Свіслач на лініі Ваўкавыск—Свіслач, знаходзіцца за 3 км ад гар. пасёлка. За 90 км на Пд ад Гродна. Аўтадарогамі злучана з гарадамі Гродна, Ваўкавыск, г.п. Поразава. 7,8 тыс. ж. (2001).

Упершыню ў пісьмовых крыніцах С. згадваецца ў канцы 15 — пач. 16 ст. як вялікакняжацкая маёмасць. У сярэдзіне 16—19 ст. прыватная ўласнасць. Належала Заслаўскім (з 1542), Крышпінам (з пач. 17 ст.), Тышкевічам (2-я пал. 18 ст. — 1831). У 18 ст. граф В.Тышкевіч заклаў парк і ў ім пабудаваў палац. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) у складзе Рас. імперыі, з 1801 цэнтр воласці Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ. На мяжы 18—19 ст. дзейнічаў Свіслацкі тэатр Тышкевічаў. У 1-й пал. 19 ст. працавала папяровая мануфактура, пабудаваны гандл. рады. У 1804 Тышкевіч заснаваў Свіслацкую гімназію. У 1851 гімназія пераўтворана ў 5-класнае дваранскае вучылішча, якое скончыў К.Каліноўскі; з 1876 *Свіслацкая настаўніцкая семінарыя*. У 1833 у С. 1256 ж., 146 драўляных і 1 мураваны дом, 48 крам. У 1897—3099 ж.,

526 дамоў (502 драўляныя, 24 мураваныя), 6 гарбарных, піваварнае, 2 медаварныя прадпрыемствы, сельская лячэбніца. У канцы 19 ст. штогод праводзіўся кірмаш. У 1921—39 у складзе Польшчы, у Ваўкавыскім пав. Беластоцкага ваяв. З канца 1939 у Беластоцкай вобл. БССР, з 15.1.1940 гар. пасёлак, цэнтр *Свіслацкага раёна*. У Вял. Айч. вайну з чэрв. 1941 да 17.7.1944 акупіравана ням. фашыстамі, якія загубілі ў С. і раёне 4859 чал. Дзейнічалі падп. райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ. З 20.9.1944 у складзе Гродзенскай вобл.

Працуюць харчкамбінат, камбінат каап. прам-сці, з-д жалезабетонных вырабаў, сумеснае прадпрыемства «Свіда»; 2 сярэднія школы, 2 дашкольныя ўстановы, Дом культуры, б-ка, бальніца, царква, касцёл, сінагога, мячэць, *Свіслацкі гісторыка-краязнаўчы музей*. Брацкія магілы сав. воінаў, партызан і ахвяр фашызму. Помнікі: землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну, К.Каліноўскаму, Р.Траўгуту. Помнікі архітэктуры — парк (18 ст.), будынак гімназіі (1802—03).

Гасцініца **«Свіслач»**.

СВІ́СЛАЧ, вёска ў Асіповіцкім р-не Магілёўскай вобл., пры ўпадзенні р. Свіслач у Бярэзіну (бас. р. Дняпро); прыстань на правым беразе р. Бярэзіна. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 34 км на ПнУ ад г. Асіповічы, 150 км ад Магілёва, 5 км ад чыг. ст. Ялізава. 820 ж., 277 двароў (2001). Дзіцячы санаторый «Свіслач». Сярэдняя і базавая школы, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Свята-Мікольская царква. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. На ўсх. ускраіне вёскі гарадзішча Свіслач.

На мяжы 11—12 ст. на месцы вёскі існавала паселішча замкавага тыпу, умацаванае земляным валам і ровам. У 16 ст. тут быў *Свіслацкі замак*. Каля 1600 уласнасць мінскага кашталяна. З 1793 у складзе Рас. імперыі У 1886 мястэчка, цэнтр воласці Бабруйскага пав. Мінскай губ.; 420 ж., 46 двароў, 2 школы, валасное праўленне, 2 царквы, касцёл, паштовае аддзяленне, 40 крам. З 1924 цэнтр *Свіслацкага раёна*, з 1931 цэнтр сельсавета ў Асіповіцкім р-не. У Вял. Айч. вайну 12—14.10.1941 ням. фашысты загубілі ў С. 791 чал., у чэрв. 1944 спалілі вёску.

СВІ́СЛАЧ, вёска ў Квасоўскім с/с Гродзенскага р-на, на р. Свіслач. Цэнтр калгаса. За 22 км на ПдУ ад Гродна. 955 ж., 346 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Свята-Крыжаўзвіжанская царква (1884). Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік архітэктуры — сядзібны дом (канец 19 ст.).

«СВІ́СЛАЧ», гасцініца ў Мінску. Пабудавана ў 1938 (арх. А.П.Воінаў). Да 1987 наз. «Беларусь». У кампазіцыі 5-павярховага будынка вылучаны 6-павярховы вуглавы паўкруглы ў плане аб'ём з цэнтр. уваходам. Да яго пад прамым вуглом прымыкаюць бакавыя крылы. Пластыку фасадаў ствараюць рытмічна пастаўленыя трохчвэртныя калоны без баз і капітэлей, якія падтрымліваюць атыкавы паверх. Калоны цэнтр. ч. найб. па маштабе. У Вял. Айч. вайну гасцініца спалена, адноўлена паводле праекта аўтара ў 1947. У 1978 рэстаран гасцініцы рэканструяваны і расшыраны (арх. Л.Мельнік, інтэр'еры афармлены скульпт. А.Глебавым). *А.А.Воінаў.*

СВІ́СТКІ, механічныя прыстасаванні для пераўтварэння кінетычнай энергіі струменя ў энергію акустычных ваганняў. У адрозненне ад сірэн не маюць вярчальных або рухомых частак. Аўтавагальны рэжым цячэння высокаскараснога струменя ствараюць тармажэннем полым рэзанатарам або клінам, які мае рэзанансную поласць. Акустычная магутнасць С. значна ніжэйшая, чым у *газаструменных выпрамяняльніках* (не перавышае некалькіх дзесяткаў ват).

Паводле рабочага цела С. бываюць газавыя (паветраныя, пераважна віхравыя, С. Гальтана, т. зв. губныя) і вадкасныя (з пласціністымі ці стрыжнёвымі вібратарамі). Газавыя С. выкарыстоўваюць пераважна для бясшумнай сігналізацыі, вадкасныя — для інтэнсіфікацыі цепламасаабменных працэсаў.

Схемы **свісткоў**: а — віхравога (1 — трубка для падачы газу, 2 — цыліндрычная камера, 3 — выхадная трубка); б — губнога (1 — шчылінападобнае сапло, 2 — востры край рэзанатара, 3 — рэзанансная камера).

СВІ́СЦЁЛКА, свістулька, народны духавы муз. інструмент тыпу глабулярнай *флейты*, вядомы многім народам свету. Мае рэзанатарную поласць, свісткавае прыстасаванне і 2—5 ігравых адтулін. Гучанне даволі моцнае, яркае і ў той жа час мяккае, крыху прыглушанае. Нярэдка іх выраб набываў характар самаст. промыслу (гл. *Дымкаўская цацка*). На Беларусі вядома з часоў неаліту. На думку некат. даследчыкаў, у першабытныя часы С. выконвалі ролю не толькі дзіцячай забаўкі, але мелі і рытуальнае прызначэнне: свіст павінен быў адганяць «злых духаў». Сімвалічнае значэнне меў і выбар сюжэтаў (конік, козлік, пеўнік, качка); С. ў выглядзе антрапаморфнай фігуркі абазначалі продкаў. Выраб С. звычайна спадарожнічаў ганчарству, нярэдка лепкай іх займаліся жанчыны і дзеці. Пустацелае тулава С. фармавалі на пальцы або цыліндрычнай палачцы (форма), свісток і бакавыя ігравыя адтуліны (звычайна 2) рабілі іголкападобнай драўлянай праколкай (шыпулём). Абпаленыя разам з посудам у хатняй печы ці ганчарным горне, С. былі тэракотавыя, глазураваныя ці чорназадымленыя. У наш час пашырыліся як сувенірныя і маст. вырабы, нярэдка як нар. духавыя муз. інструменты для выканання нескладаных песенных і танцавальных мелодый, імітацыі спеваў птушак (звычайна ў складзе фалькл. калектываў).

Літ.: Милюченков С.А. Белорусское народное гончарство. Мн., 1984; Назина И.Д. Белорусские народные музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые. Мн., 1979; Сахута Я.М. Беларуская народная кераміка. Мн., 1987.

І.Д.Назіна, Я.М.Сахута.

СВІСЦЯ́ЧЫЯ ГУ́КІ, гл. ў арт. *Зычныя гукі*.

СВІ́ТА (франц. suite), 1) асобы, якія суправаджаюць важную, высокапастаўленую асобу (напр., караля, прэзідэнта); пастаяннае акружэнне такой асобы. 2) Асобы, якія пастаянна суправаджаюць кагосьці ці акружаюць каго-небудзь. 3) Сукупнасць пластоў горных парод, якія аб'яднаны ўзростам, падобным саставам і ў пэўнай ступені адрозніваюцца ад пластоў, што залягаюць вышэй і ніжэй (гл. *Світа геалагічная*). 4) Назва верхняга адзення з сукна (гл. *Світка*).

СВІ́ТА, возера ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Мядзелка, за 7 км на Пд ад г. Паставы. Пл. 0,83 км^2, даўж. 1,5 км, найб. шыр. каля 1,1 км, найб. глыб. 31 м, даўж. берагавой лініі 5,4 км. Пл. вадазбору 22 км^2. Катлавіна эварзійнага тыпу. Схілы выш. 20—35 м, пад лесам і хмызняком, у верхняй ч. часткова разараныя. Пойма шыр. 10—15 м, на З да 200 м. Берагі нізкія, пясчаныя, пад хмызняком. На Пн залівы. З астравы, агульнай пл. 1,6 га. Дно ў пры-

бярэжнай ч. пясчанае, глыбей гліністае. Зарастае слаба. Упадаюць 3 ручаі, у т.л. з воз. Чэцверць, выцякае ручай у воз. Світка.

СВІ́ТА Канстанцін Мікалаевіч (11.11.1896, в. Сёмкава Слабада Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 24.12.1981), генерал-маёр (1944). Скончыў ваен. вучылішча (1917), вышэйшыя стралк.-тактычныя курсы (1931). У арміі з 1915, у Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік грамадз. вайны, разгрому антыбальшавіцкага кранштацкага паўстання 1921. Да 1941 у штабе БВА. У Вял. Айч. вайну на Паўд.-Зах., Карэльскім і 1-м Укр. франтах: нач. тылу арміі; удзельнік Старарускай, Свірска-Петразаводскай, Віслa-Одэрскай, Берлінскай і Пражскай аперацый. Да 1955 у Сав. Арміі.

СВІ́ТА ГЕАЛАГІ́ЧНАЯ, стратыграфічная адзінка, асн. падраздзяленне мясц. стратыграфічных схем. Уключаюць амаль аднародныя асадкавыя, вулканагенныя метамарфічныя горныя пароды або чаргаваныя пароды розных тыпаў. Маюць уласную геагр. назву і аб'ядноўваюцца ў *серыі геалагічныя*. Падзяляюцца на падсвіты, пачкі, пласты, слаі. Паводле аб'ёму могуць адпавядаць ч. яруса або некалькім ярусам. З'яўляецца асн. аб'ектам карціравання пры геал. здымках. Пры яе вылучэнні ўлічваецца рэчыўны склад; палеанталаг. рэшткі дапаўняюць літалаг. і фацыяльную характарыстыку і з'яўляюцца паказчыкамі адноснага ўзросту. На Беларусі світы, вылучаныя ў розных ч. разрэзу крышт. фундамента і платформавага чахла, складзены з парод: метамарфічных (напр., людзяневіцкая світа ў крышт. фундаменце); тэрыгенных (аршанская і пінская ў рыфеі, рэдкінская і котлінская ў вендзе, рыцкая і страдзецкая ў кембрыі, прудкоўская і дудзіцкая ў пермі, каранёўская і мазырская ў трыясе і інш.); карбанатных (прыбугская і навасёлкаўская ў ардовіку, мухавецкая і кусцінская ў сілуры); саляносных (капаткевіцкая і салігорская ў дэвоне); вулканагенных і вулканагенна-асадкавых (ратайчыцкая ў вендзе, васілеўская і шарпілаўская ў дэвоне). *С.А.Кручак.*

Свісцёлкі «Коннікі». Вёска Ракаў Валожынскага раёна Мінскай вобл. 1930-я г.



«СВІТА́ННЕ», газета Беларускага рабоча-сял. пасольскага клуба *«Змаганне»*. Выдавалася 7—31.1.1930 у Вільні на бел. мове штотыднёва. На той час адзінае легальнае дэмакр. выданне, вакол якога групаваліся прадстаўнікі рэв.-дэмакр. актыву і члены КПЗБ. Асвятляла дзейнасць *Таварыства беларускай школы*, культ. буд-ва ў БССР. Змяшчала публіцыстычныя артыкулы («Еўрапейскі сялянскі кангрэс», «Танец смерці», «Зноў голад у Заходняй Беларусі» і інш.), у якіх узнімаліся праблемы сац.-эканам. становішча ў Зах. Беларусі. Выйшлі 4 нумары, усе канфіскаваны польскімі ўладамі. *С.В.Говін.*

СВІ́ТКА, возера ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Мядзелка, за 7 км на Пд ад г. Паставы. Пл. 0,23 км^2, даўж. 870 м, найб. шыр. 500 м, даўж. берагавой лініі 2 км. Пл. вадазбору 23,5 км^2. Катлавіна тэрмакарставага тыпу. Схілы выш. да 8 м, на ПдЗ да 13 м, пераважна спадзістыя, часткова разараныя. Злучана ручаём з воз. Світа; выцякае р. Спорыца.

СВІ́ТКА, верхняе мужчынскае і жаночае адзенне з сукна. Бытавала ў беларусаў, рускіх, украінцаў да 1930-х г. На Пн Беларусі насілі С. прамога халатападобнага крою (спінка і пярэдняе крыссе прамыя), у цэнтр. раёнах — з адразной спінкай (ніжняя частка ў зборкі, пярэдняе крыссе прамое) і з неадразной спінкай, звужанай у таліі (ад проймы рукавоў зашывалі вытачкі, якія ніжэй таліі ўтваралі фальбоны альбо фалды). Для Палесся характэрны С. з «вусамі» — вял. клінамі, ушытымі па баках ад таліі і ўпрыгожанымі каляровым шнурам, пярэстымі пампонамі, вышыўкай. *М.Ф.Раманюк.*

СВІФТ (Swift) Джонатан (30.11.1667, Дублін — 19.10.1745), англійскі пісьменнік. Вучыўся ў Трыніты-каледжы Дублінскага ун-та (1682—88). У 1689—99 літ. сакратар і бібліятэкар дыпламата і эсэіста У.Тэмпла. У 1692 атрымаў ступень магістра мастацтваў у Оксфардскім ун-це. У 1695 прыняў сан свяшчэнніка. Д-р багаслоўя (1702). У 1710—14 зблізіўся з кіраўнікамі ўрада торы, падтрымліваў і накіроўваў іх урадавую палітыку ў артыкулах і памфлетах.

Дж. Свіфт.

У 1713 настаяцель сабора св. Патрыка ў Дубліне. Літ. дзейнасць пачаў як паэт. Першыя паэт. творы насілі парадыйны характар і высмейвалі манернасць т. зв. высокай паэзіі. Майстар паліт. памфлета, у якім асуджаў унутр. палітыку Англіі, калан. войны, выступаў супраць забабонаў і невуцтва. У памфлетах «Бітва кніг» (1697) і «Казка бочкі» (1704), напісаных у алегарычнай форме і насычаных паліт., антырэліг. сатырай, — ідэі карыснасці ведаў. Памфлеты «Пісьмы Суконшчыка» (1723—24), «Сціплая прапанова» (1729) прысвечаны барацьбе за правы ірл. народа. Асн. твор — раман «Падарожжы Гулівера» (1726), у якім вострая сатыра на славалюбства і крывадушнасць тагачасных судоў, паліт. дзеячаў і партый; у ім С. стварыў гратэскавы партрэт грамадства, з дапамогай якога высмейваецца ўсё чалавецтва. У апісанні падарожжа ў

Дзяўчаты ў **світках**. Вёска Вугляны Камянецкага раёна Брэсцкай вобл. Пач. 20 ст.

краіну ліліпутаў С. праводзіць ідэю аб выхаванні дзяцей у атмасферы справядлівасці, мужнасці, рэлігійнасці і любві да сваёй краіны. Вобразы патрыярхальных і мудрых волатаў, якія займаюцца мірнай плённай працай і не ведаюць зброі, служаць для акцэнтавання ідэалу пісьменніка — адукаванай манархіі. Апошняя частка рамана, якая апавядае пра разумных коней, напоўнена песімізмам: С. ужо не верыць у адраджэнне дабрадзейнасці людзей, аднак вобраз Гулівера, простага, працавітага і сумленнага чалавека, заклікае да самаўдасканалення. Паводле рамана зняты маст. і мультыплікацыйныя фільмы (Англія, ЗША, Іспанія). Бел. т-р юнага гледача паставіў спектакль «У краіне ліліпутаў» (1985). На бел. мову раман пераклаў А.Кудравец.

Тв.: Бел. пер. — Падарожжы Гулівера. Мн., 1974; Рус. пер. — Памфлеты. М., 1955; Дневник для Стеллы. М., 1981; Путешествия Гулливера... Мн., 1992; Приключения Гулливера в Лилипутии. Мн., 1996.

Літ.: Муравьев В.С. Джонатан Свифт. М., 1968; Дубашинский И.А. Памфлеты Свифта. Рига, 1968; Левидов М.Ю. Путешествие.., мысли и чувства Джонатана Свифта... М., 1986. *М.С.Рагачэўская.*

СВІЦЯЗЬ, возера ў Навагрудскім р-не Гродзенскай вобл., у бас. р. Моўчадзь, за 22 км на Пд ад г. Навагрудак, на тэр. ландшафтнага заказніка *Свіцязянскі*. Пл. 2,24 км^2, даўж. 1,7 км, найб. шыр. 1,6 км, найб. глыб. 15 м. Пл. вадазбору 14 км^2. Катлавіна прасадачнага (суфазійнага) тыпу. Схілы спадзістыя, параслі лесам, на Пд і ПдЗ забалочаныя, тарфяністыя. Прыбярэжная ч. возера да глыб. 3—5 м выслана пяском, глыбакаводная — ілам. Вада слабамінералізаваная (да 35 мг/л), празрыстасць 4—5 м. Слаба зарастае. У возеры растуць лабелія Дортмана і палушнік азёрны, занесеныя ў Чырв. кнігу Беларусі. Вышякае р. Сваротва. На возеры пансіянат «Свіцязь», шматлікія зоны адпачынку. С. услаўлена А.*Міцкевічам* у баладах «Свіцязь» і «Свіцязянка». На зах. беразе С., каля в. Валеўка, выяўлена стаянка позняга палеаліту; знойдзены крамянёвыя наканечнікі стрэл, мікраліты, скрабкі, нуклеўсы. Частка знаходак належыць да *свідэрскай культуры*.

СВІЦЯЗЯ́НСКІ, ландшафтны заказнік рэсп. значэння ў Навагрудскім р-не Гродзенскай вобл. Створаны ў 1970 для аховы унікальнага азёрна-ляснога комплексу. Пл. 1034 га. Знаходзіцца амаль у цэнтры Навагрудскага ўзвышша. Рэльеф узгорысты. Уключае воз. *Свіцязь* з прылеглым лясным масівам. Раслінасць падзоны грабава-дубова-цемнахвойных лясоў. Пераважаюць яловыя, хваёвыя, дубовыя і бярозавыя лясы, менш пашыраны асінавыя, альховыя, грабавыя. Растуць клён, ясень і породы-экзоты — лістоўніца сібірская, дуб чырвоны, таполя лаўралістая. У флоры каля 300 відаў сасудзістых раслін, з якіх палушнік азёрны, лабелія Дортмана, прыбярэжнік аднакветкавы, купальнік горны, тлушчанка звычайная, лілея кучаравая, гідрыла кальчаковая, наяда гнуткая занесены ў Чырв. кнігу. На паўн. беразе воз. Свіцязь 2 векавыя дубы — помнікі прыроды, на паўд.-зах. — група стараж. курганоў.

СВІ́ШЧ, фістула, паталагічны канал (адтуліна), які злучае ачаг захворвання (гнайнік, пухліну) з паверхняй або з якой-н. поласцю цела. Высланы эпітэліяльнай або грануляцыйнай тканкай.

Адрозніваюць вонкавы С. (адкрываецца на паверхні цела) і ўнутраны (злучае полыя органы). Бывае прыроджаны — ад заган унутрывантробнага развіцця (напр., пупковы), часцей у выніку разбурэння тканак і органаў пры траўме, паталаг. працэсах (набыты). З лек. ці эксперым. мэтамі робяць штучныя С., напр., для назірання за функцыянаваннем органаў.

СВІШЧО́ВА, курганны могільнік *дрыгавічоў* 11—12 ст. каля в. Свішчова Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. Захаваліся 20 насыпаў выш. 0,2—1,6 м, дыям. 4—8 м, іх аснова абкладзена камянямі. Даследаваны 23 курганы. У некат. насыпах шчыльная вымастка з камянёў. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. Пахаванні пераважна адзіночныя, ёсць парныя. Знойдзены ганчарныя гаршкі, метал. часткі драўлянага посуду, нажы, падкова, цуглі, прасліца з ружовага сланцу, тачыльныя брускі, метал. пярсцёнкі, спражкі, шкляныя залачоныя пацеркі і бронзавыя, упрыгожаныя зерню (дрыгавіцкага тыпу), скроневыя кольцы з такіх пацерак, паўтараабаротныя і з S-падобным завітком і інш.

СВІШЧО́Ў Георгій Пятровіч (н. 24.12.1912, С.-Пецярбург — 3.5.1999), савецкі вучоны ў галіне авіяцыйнай механікі. Акад. Рас. АН (1976, чл.-кар. 1966). Двойчы Герой Сац. Працы (1957, 1982). Скончыў Маскоўскі дырыжаблебуд. ін-т (1935). З 1935 у КБ дырыжаблебудаўніцтва. У 1940—54 і з 1967 у Цэнтр. аэрагідрадынамічным ін-це (з 1967 нач.).

Г.П.Свішчоў.

У 1954—67 нач. Цэнтр. ін-та авіяц. маторабудавання. Навук. працы па аэрадынаміцы самалётаў і рухальных установак. Ленінская прэмія 1976. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1952, 1968.

СВІ́ЯЗІ (Anas), птушкі сям. качыных атр. гусепадобных. 2 віды: С. (A. penelope), С. амерыканская (A. americana). Пашыраны пераважна на Пн Еўразіі і Паўн. Амерыкі. Жывуць на зарослых вадаёмах. На Беларусі 1 від — С. penelope, занесены ў Чырв. кнігу.

Даўж. цела да 55 см, маса да 1 кг. Галава ў самца С. ржава-карычневая з залацістажоўтым ілбом і цемем, астатняе апярэнне шэрае і белае. Самка карычнявата-бурая з чорнымі стракацінамі і белым брухам. Адкладваюць 7—10 яец. Пераважна раслінаедныя. Аб'екты палявання.

СВО́БАДА (Svoboda) Людвік (25.11.1895, в. Грознецін, Чэхія — 20.9.1979), чэхаславацкі дзяржаўны і ваен. дзеяч. Ген. арміі (1945). Тройчы Герой (1965, 1970, 1975), Герой Сав. Саюза (1965). Працаваў аграномам. З 1915 на ўсх. фронце аўстра-венг. арміі. На чале групы вайскоўцаў-чэхаў перайшоў лінію фронту і ў 1916 уступіў у чэхаславацкі

Мікуліны

Свіязі: 1 — самка; 2 — самец.

легіён, які фарміраваўся ў Расіі. З 1920 на радзіме, афіцэр чэхаславацкай арміі. у 1931—34 выкладчык Ваен. акадэміі ў Граніцы (Маравія). Пасля акупацыі герм. войскамі Чэхаславакіі адзін з арганізатараў падп. антыфаш. ваен. арг-цыі. Летам 1939 выехаў у Польшчу, сфарміраваў чэхаславацкую вайсковую часць і з пач. 2-й сусв. вайны перайшоў з ёю ў СССР. У 1942 узначаліў 2-і Чэхаславацкі пяхотны батальён, у 1943 — 1-ю Чэхаславацкую асобную брыгаду (з 1944 армейскі корпус), якая ў складзе 1-га Укр. фронту ўдзельнічала ў Карпацка-Дукельскай аперацыі 1944, змагалася ў Славакіі і Маравіі, а пасля вызвалення Чэхаславакіі (1945) стала асновай стварэння ўзбр. сіл краіны. У 1945—50 С. — міністр нац. абароны, у 1950—51 нам. старшыні ўрада Чэхаславакіі. У 1955—59 нач. Ваен. акадэміі імя К.Готвальда. У перыяд *«Пражскай вясны»* 1968 прыхільнік дэмакр. рэформ. З сак. 1968 па май 1975 прэзідэнт ЧССР, вярх. галоўнакамандуючы ўзбр. сіламі ЧССР. Чэхаславацкая прэмія міру (1968), Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» (1970).

Літ.: Марьина В.В. Чехословацкий легион в СССР (1939—1941 гг.) // Вопр. истории. 1998. №2.

«СВОБО́ДНЫЕ НО́ВОСТИ», незалежная інфармацыйна-аналіт. газета. Выдаецца з 1991 у Мінску на бел. і рус. мовах штотыднёва; у 1994— 97 выходзіла пад назвай «Свободные новости плюс». Дае рознабаковую інфармацыю як кіруючых улад, так і апазіц. ім структур. Друкуе інфарм.-аналіт. матэрыялы, культуралагічную, гіст., спарт., мед. інфармацыю. *А.І.Карповіч.*

СВО́ЙСКІЯ ЖЫВЁЛЫ, жывёлы, якія былі прыручаны чалавекам і гадуюцца ім для задавальнення гасп., эстэт. і інш. патрэб. Да іх адносяць: буйн. і дробную раг. жывёлу, свіней, коней, вярблюдаў, лам, якаў, аслоў, паўн. аленяў, трусоў, сабак, катоў, курэй, гусей, качак, індыкоў, пчол, тутавых шаўкапрадаў і інш. Паходзяць ад дзікіх продкаў (гл. *Прыручэнне жывёл*), адрозніваюцца ад іх паводзінамі, анатама-фізіял. прыкметамі, прадукцыйнасцю і інш., што з'яўляецца вынікам накіраванага ўздзеяння чалавека. Амаль усе С.ж. маюць шматлікія пароды. Прамежкавай стадыяй паміж дзікімі і С.ж. лічацца маралы, лісы, пясцы, собалі, норкі, нутрыі, страусы, зебры, сланы, лоўчыя птушкі, якіх разводзяць у паўвольных умовах ці ў няволі. Блізкія да С.ж. «дэкаратыўныя» птушкі (канарэйкі, паўліны), акварыумныя і сажалкавыя рыбы, лабараторныя жывёлы (мышы, пацукі).

СВО́ЛЬНА, рака ў Расіі і Беларусі, правы прыток р. Дрыса (бас. р. Зах. Дзвіна). Даўж. 99 км, у т.л. ў межах Беларусі 93 км, пл. вадазбору 1510 км^2. Выцякае з воз. Нечарыца (Себежскі р-н Пскоўскай вобл.), вусце насупраць в. Цясты Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. (на левым беразе р. Дрыса). Цячэ па Асвейскай градзе і Полацкай нізіне. Асн. прытокі на Беларусі: Лонніца, Лешня (злева), Піжаўка, Водзьга (справа). Даліна трапецападобная, шыр. ў верхнім і сярэднім цячэнні 400—600 м, у ніжнім 800—1500 м. Схілы спадзістыя, месцамі ўмерана стромкія, выш. 10—20 м. Пойма перарывістая, месцамі забалочаная, шыр. 100—300 м. Рэчышча звілістае, месцамі моцназвілістае, шыр. 18—20 м, берагі стромкія. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. На перыяд веснавога разводдзя прыпадае 40% гадавога сцёку. Найвышэйшы ўзровень разводдзя ў ніжнім цячэнні ў 1-й дэкадзе крас., сярэдняя выш. над меженным узроўнем 4,5 м, найб. 7,7 м. Замярзае ў сярэдзіне снеж., крыгалом у пач. красавіка. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 11,7 м^3/с. Рака — водапрыёмнік меліярац. сістэм. *А.А.Макарэвіч.*

СВЯ́ДАВА, возера ў Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Шоша, за 30 км на ПнУ ад г. Глыбокае. Пл. 0,74 км^2, даўж. каля 2,1 км, найб. шыр. 660 м, найб. глыб. 11,5 м, даўж. берагавой лініі больш за 6,3 км. Пл. вадазбору 5,25 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы выш. 5—10 м (на З 10—16 м), пераважна разараныя. На ПдЗ і З пойма шыр. да 200 м. Берагі нізкія, пад хмызняком, у залівах сплавінныя. 2 астравы агульнай пл. 0,4 га. Дно выслана гліністым ілам, мелкаводдзе пясчанае. Шыр. паласы прыбярэжнай расліннасці да 70 м. Упадаюць 3 ручаі, выцякае ручай у воз. Доўгае.

СВЯ́ДЗІЦА, рака ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл., правы прыток р. Эса (бас. р. Зах. Дзвіна). Даўж. 34 км. Пл. вадазбору 225 км^2. Пачынаецца за 1,2 км на Пд ад в. Грыгаравічы, вусце каля в. Вілы. Пачынаецца на схілах Лукомскага ўзв. і цячэ ў межах Ушацка-Лепельскага ўзв. Даліна ў верхнім цячэнні звілістая, трапецападобная (шыр. 300—500 м), у ніжнім невыразная, зліваецца з прылеглай мясцовасцю. Пойма ў верхнім цячэнні адсутнічае, у сярэднім і ніжнім вузкая, чаргуецца па берагах. Рэчышча на вялікім працягу звілістае, у ніжнім цячэнні на працягу амаль 12 км каналізаванае, шыр. ў верхнім цячэнні 0,5—2,5 м, у ніжнім 10—18 м. Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік меліярац. сістэм.

СВЯДО́МАСЦЬ, вышэйшы ўзровень адлюстравання рэчаіснасці, уласцівы толькі чалавеку. Выяўляецца ў пачуццёвых вобразах (адлюстроўваюць знешні бок прадметаў і з'яў), *паняццях* (абагульняюць уласцівасці і ўзаемасувязі прадметаў і з'яў), ацэначных меркаваннях (выяўляюць адносіны чалавека да з'яў рэчаіснасці). Выкарыстанне славесных моўных знакаў з'яўляецца спосабам кадзіравання інфармацыі, уласцівае толькі чалавеку. Выяўленая ў паняццях і замацаваная ў мове інфармацыя з'яўляецца вынікам пазнавальнай дзейнасці чалавецтва ў працэсе грамадска-гіст. развіцця і складае яго *веды*. С. характарызуецца здольнасцю адлюстроўваць рэчаіснасць у форме ведаў і падпарадкоўваць свае паводзіны агульначалавечым законам. Наасноае ведаў чалавек арыентуецца ў навакольным асяроддзі і творча ператварае яго ў сваіх інтарэсах. С. уключае пазнавальныя працэсы, звязаныя з атрыманнем ведаў: *адчуванні, памяць, успрыманне, уяўленне*, канкрэтна-дзейнае і наглядна-вобразнае *мысленне*, але дамінантай С. з'яўляецца паняційнае, абстрактна-лагічнае мысленне. Важнае месца ў структуры С. займае эмацыянальна-валявая сфера, звязаная з эмацыянальна-пачуццёвым перажываннем рэчаіснасці, каштоўнаснымі адносінамі да аб'екта і мабілізацыяй актыўнасці для дасягнення мэт шляхам валявых намаганняў. С. з'яўляецца цэласным, інтэграваным адлюстраваннем знешняга свету, дзе ўсе кампаненты ўзгоднена ўзаемадзейнічаюць. Змест С. ідэальны: ён не можа быць апісаны прасторавымі характарыстыкамі, але залежыць ад свайго матэрыяльнага носьбіта — чалавечага мозга. Органам вышэйшых псіхічных функцый з'яўляецца кара вял. паўшар'яў галаўнога мозга. С. чалавека сацыяльна абумоўлена і ўзнікае ў працэсе зносін з інш. людзьмі; яна не з'яўляецца прыроджанай уласцівасцю. У гіст. аспекце С. фарміравалася ў працэсе *антрапагенезу*. У пазнавальнай і практычнай дзейнасці спачатку пераважалі канкрэтна-дзейны і наглядна-вобразны віды мыслення, у далейшым узнікла і стала прэваліраваць абстрактна-лагічнае мысленне. Развіццё *інтэлекту* чалавека цесна звязана з культ.-гіст. развіццём грамадства. У мове, наглядна-вобразных формах культуры выяўляюцца агульныя для чалавецтва ідэі, якія складаюць *грамадскую свядомасць* — аснову фарміравання чалавечай С. Значную ролю ў С. адыгрываюць *самасвядомасць* і *рэфлексія* асобы, якія садзейнічаюць здольнасці чалавека да самааналізу і прывядзення яго ўнутр. свету ў адпаведнасць са знешнімі абставінамі; *светапогляд*, які з'яўляецца асновай каштоўнасных арыентацый асобы і яго паводзін. Псіхічная дзейнасць чалавека не вычэрпваецца С. Адначасова са свядомым узроўнем псіхікі функцыянуюць *бессвядомае* (інстынктыўна-рэфлексіўная дзейнасць) і падсвядомае (аўтаматызаваныя стэрэатыпы паводзін: уменні, навыкі, звычкі, інтуіцыя). Неўсвядомленая сфера псіхікі знаходзіцца ва ўзаемадзеянні са С.: працэсы, якія ўзнікаюць у бессвядомым могуць стаць свядомымі, і, наадварот, свядомае можа выцясняцца ў бессвядомае. Тэорыя падсвядомасці (*псіхааналіз*) створана З.Фрэйдам і развіта К.Г.Юнгам. Акрамя падсвядомасці Фрэйд вылучаў звышсвядомасць — здольнасць чалавека да маральнага самакантролю. Да звышсвядомасці адносяцца духоўная сфера чалавека, супрацьлеглая эгаістычнай абмежаванасці, маральная дасканаласць, самарэгуляцыя дзейнасці асобы.

Літ.: Протасеня П.Ф. Происхождение сознания и его особенности. Мн., 1959; Дубровский Д.И. Проблема идеального. М., 1983; Жуков Н.И. Проблема сознания. Мн., 1987; Социальная сила знания. Мн., 1991; Елсуков А.Н. Познание и миф. Мн., 1984; Еникеев М.И. Общая и социальная психология. М., 2000. *В.Дз.Марозаў.*

СВЯДО́МАСЦЬ І СТЫХІ́ЙНАСЦЬ, філасофскія катэгорыі, якія характарызуюць працяканне працэсаў у грамадстве і прыродзе. Свядомасць характэрна для дзейнасці чалавека і ажыццяўляецца ў адпаведнасці з пастаўленымі мэтамі, стыхійнасць — для спантанных, ненаўмысных дзеянняў. У дзейнасці людзей яны спалучаюцца. У штодзённай практыцы дзейнасць чалавека, калектыву ці арг-цыі, накіраваная на задавальненне патрэбнасцей, носіць свядомы характар. У маштабах грамадства ўвогуле развіццё набывае стыхійны характар у сувязі з несупадзенням інтарэсаў асобных людзей, сац. груп і рознай накіраванасцю іх дзейнасці. Вынікі рознанакіраваных стыхійных працэсаў у грамадстве непрадказальныя і часам могуць прыводзіць да разбуральных працэсаў (эканам., экалагічныя, паліт., духоўныя і інш. крызісы, войны, тэрарызм, рост злачыннасці, нац. і рэліг. экстрэмізм і інш.). Уласцівае прыродзе стыхійнае развіццё паслужыла асновай для з'яўлення высокаарганізаваных відаў раслін, жывёл, а потым і чалавека. Кожны арганізм развіваецца стыхійна і адначасова ўпарадкавана (у адпаведнасці з праграмай, закладзенай у малекулах ДНК клетачных ядраў). Пазітыўныя стыхійныя працэсы часта характэрны і для грамадства. Стыхійнасць у прыродзе і грамадстве звязана з іх здольнасцю да *самаарганізацыі*. Згодна з даследаваннямі ў галіне *сінергетыкі*, павышэнне арг-цыі ў *самаарганізавальных сістэмах* адбываецца спантанна, у пераломныя моманты якасных пераўтварэнняў, пад уплывам выпадковых абставін прыводзіць да стварэння новых арганізаваных структур. Эвалюцыю самаарганізавальных працэсаў дакладна прагназіраваць немагчыма. Стыхійныя працэсы самаарганізацыі ў грамадстве стрымліваюцца дзярж. законамі. Значную ролю ў свядомым рэгуляванні грамадскімі працэсамі і скарачэнні элементаў стыхійнасці адыгрываюць *мадэліраванне сацыяльнае, прагназіраванне сацыяльнае*. Аднак кантраляваць і планаваць усе сац. працэсы немагчыма. Правільнае разуменне суадносін паміж С. і с. ў грамадскіх з'явах дазваляе пазбегнуць гранічнага фаталізму і суб'ектыўнага валюнтарызму ў пазнанні сац. працэсаў.

Літ.: Пригожин И., Стенгерс И. Порядок из хаоса: Новый диалог человека с природой: Пер. с англ. М., 1986; Князева Е.Н., Курдюмов С.П. Синергетика как новое мировидение: диалог с И.Пригожиным // Вопр. философии. 1992. № 12; Самоорганизация и наука: Опыт филос. осмысления. М., 1994. *В.Дз.Марозаў.*

СВЯКРО́Ў, свякруха, маці мужа. У некаторых мясцовасцях наз. свякроўка.

СВЯНЦІ́ЦКАЯ Ірына Сяргееўна (28.1.1929, г. Пушкін Ленінградскай вобл., Расія), расійскі гісторык. Д-р гіст. н. (1973), праф. (1976). Скончыла Ленінградскі ун-т (1951). З 1954 у Маскоўскім адкрытым пед. ун-це. Даследуе гісторыю элінізму, усх. правінцый Рым. імперыі і ранняга хрысціянства; выступае з абгрунтаванай крытыкай міфалагічнай тэорыі ў гісторыі хрысціянства.

Тв.: Запрещенные евангелия. М., 1965; Раннее христианство: страницы истории. М., 1987; Апокрифические евангелия. М., 1996; Сказания об Иисусе, Святом семействе и свидетелях христовых. М., 2000.

Літ.: Кнабе Г.С. К 70-летию И.С. Свенцицкой // Вестн. древней истории. 1999. № 2.

СВЯНЦІ́ЦКІ Іларыён Сямёнавіч (7.4.1876, г. Буск Львоўскай вобл., Украіна — 18.9.1956), украінскі філолаг-славіст, мовазнавец. Д-р слав. філалогіі (1902). Д-р філал. н. (1941), праф. (1939). Скончыў Львоўскі ун-т (1899), Пецярб. археал. ін-т (1900). Арганізатар і дырэктар (1905—52) Львоўскага Нац. музея (Музей укр. мастацтва). Для бел. аддзела сабраў 23 слуцкія паясы, 12 кніг «Бібліі» Ф.Скарыны, бел. старадрукі, рукапісныя кнігі, граматы, акты, абразы і інш. У кн. «Адраджэнне беларускага пісьменства» (1908) даў высокую ацэнку развіццю новай бел. л-ры, у дадатку да яе змясціў забароненыя ў Расіі вершы Я.Купалы «Там» і «Што ты спіш?». Гісторыі бел. культуры і л-ры прысвяціў працу «Асновы адраджэння беларускага пісьменства» (1914), адлюстраваў гэтыя праблемы і ў кн. «Пачатак кнігадрукавання на землях Украіны 1573—1791» (1924) і інш. Кн. «Росквіт культурна-нацыянальнага жыцця Усходняй Беларусі» (1928) — першае ў Зах. Украіне даследаванне бел. л-ры.

Тв.: Опись музея Ставропигийского института во Львове. Львов, 1908; Лавришевское Евангелие начала XIV в. // Изв. Отд. рус. яз. и словесности имп. Акад. наук. СПб., 1913. Т. 18, кн. 1; Нариси про мову пам'яток староруського письменства XI в. // Питання слов'янського мовознавства. Львів, 1948.

Літ.: Панізнік С. Іларыён Свянціцкі // Полымя. 1968. № 3; Яго ж. Чатыры сцяжыны паэта // Дзень паэзіі-72. Мн., 1972; Кабржыцкая Т., Рагойша В. Карані дружбы. Мн., 1976; Рагойша В. «Шчырапаважаны прафесар...» // Рагойша В. Напісана рукой Купалы. Мн., 1981. *С.С.Панізнік.*

СВЯНЦІ́ЦКІ Сігізмунд Карлавіч (20.10.1836, в. Красцінава Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. — 21.5.1910), бел. ўрач, адзін з заснавальнікаў унутрыполасцевай хірургіі. Д-р медыцыны (1864). Скончыў медыка-хірург. акадэмію ў Пецярбургу (1861). З 1870 урач у Мінску; арганізаваў бясплатную амбулаторыю для бедных (1879). Навук. працы па пытаннях хірургіі. Чл. Мінскага т-ва ўрачоў (з 1870 яго прэзідэнт).

СВЯНЦЯ́НСКІ ПАВЕ́Т. Утвораны ў 1795 на тэр. паўн.-зах. часткі былога Ашмянскага пав. ВКЛ, далучанай да Расіі ў выніку 3-га падзелу Рэчы Паспалітай. Да 1842 наз. Завілейскім пав. Уваходзіў у Віленскую губ., з 12.12.1796 — у Літоўскую, з 9.9.1801 — зноў у Віленскую. Цэнтр — г. Свянцяны. Пл. каля 4,8 тыс. км², з іх каля 22% займалі ворныя землі, 32% — лясы. З 1861 падзяляўся на 22 воласці, з якіх 6 знаходзіліся на тэр. сучаснай Літоўскай Рэспублікі, а 16 — цалкам ці часткова на тэр. Беларусі (Аляксандраўская, Вішнеўская, Войстамская, Гадуцішская, Дубатоўская, Занарацкая, Кабыльніцкая, Кукуцішская, Камайская, Кемелішская, Лынгмянская, Лынтупская, Нястанішская, Свірская, Шэметаўская, Ясеўская). Насельніцтва на 1880 было 145,5 тыс. чал. (без г. Свянцяны), з іх 5,2 тыс. дваран, 13,3 тыс. мяшчан, 123,3 тыс. сялян, 3,3 тыс. ваеннаслужачых. Паводле канфесіянальнага складу — 122,4 тыс. католікаў, 13,1 тыс. праваслаўных, 5,4 тыс. стараверaў, 4 тыс. іудзеяў. Мелася 1741 паселішча, 1067 тыс. двароў. У 1915 заняты германскімі, з вясны 1919 польскімі войскамі, уключаны ў Віленскую акругу. Паводле *Рыжскага мірнага дагавора 1921* застаўся ў складзе Польскай Рэспублікі. З 22.12.1925 С.п. у складзе Віленскага ваяв. У 1930-я г. складаўся з 15 гмін. У вер. 1939 С.п. заняты Чырв.



Арміяй, 2.11.1939 далучаны да БССР і ўключаны ў Вілейскую вобл., 15.1.1940 скасаваны, яго тэрыторыя ўвайшла ў Гадуцішскі, Свянцянскі і Свірскі р-ны (гл. адпаведныя арт.). *В.Л.Насевіч.*

СВЯНЦЯ́НСКІ ПРАРЫ́Ў 1915, наступальная аперацыя германскіх войск супраць рас. войск Зах. фронту 9.9—2.10.1915 у 1-ю сусв. вайну 1914—18. Пасля няўдалай спробы акружыць 10-ю рус. армію і ўзяць Вільню (жн. 1915) герм. войскі 9 вер. пачалі новае наступленне на г. Свянцяны і 10 вер. прарвалі фронт. Кав.

група (6 дывізій) пранікла ў тылы рас. войск, захапіла Вілейку (14 вер.) і падышла да Маладзечна. Асобныя часці групы дайшлі да Барысава, а атрад конных егераў пашкодзіў чыгунку каля Смалявіч. Рас. войскі пакінулі Вільню, але немцы замацаваць поспехі не змаглі. Наступленне варожай кавалерыі 16—17 вер. было спынена 2-й рус. арміяй і ў ваколіцах Маладзечна, Вілейкі і Смаргоні яна была разбіта. Пасля 10-дзённых баёў (да 2 кастр.) герм. войскі адступілі ў раён азёр Нарач—Свір. С.п. — апошняя аперацыя манеўровага перыяду вайны на рас.-герм. фронце, пасля якой абодва бакі перайшлі да пазіцыйнай вайны. *М.І.Камінскі.*

СВЯНЦЯ́НСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1940. Утворана 15.1.1940 на частцы тэрыторыі былога Свянцянскага пав. Уваходзіў у Вілейскую вобл. БССР. Цэнтр — г. Свянцяны. 25.11.1940 большая частка тэрыторыі павета перададзена Літоўскай ССР, рэшта (Лынтупскі, Масленікаўскі і Рынкянскі с/с) уключана ў *Пастаўскі раён.* *В.Л.Насевіч.*

СВЯНЦЯ́НСКІЯ ГРА́ДЫ, Свянцянскае ўзвышша, дугападобная сістэма (з прагінам на Пд) напорных краявых ледавіковых град на ПнЗ Беларусі; фізіка-геагр. раён Бел.-Валдайскай правінцыі (акруга Бел. Паазер'я). Назва дадзена ў 1930-я г. польскімі географамі ад г. Свянцяны (цяпер Швенчоніс, Літва). Працягнуліся ад воз. Дзіснай (Літва) на тэр. Беларусі, дзе накіраваны ў паўд.-ўсх. і паўн.-ўсх. напрамках у паўд.-зах. ч. Віцебскай і паўн.-зах. ч. Мінскай абласцей. Мяжуюць з Полацкай нізінай на Пн, Ушацка-Лепельскім узв. на У, Верхнебярэзінскай і Нарачана-Вілейскай нізінамі на ПдУ і Пд. Выш. да 228 м у межах Беларусі (288, каля г. Швенчоніс, Літва), працягласць з З на У 120—130 км, з Пн на Пд 35—45 км. Пл. 2,7 тыс. км^2. С.г. прымеркаваны да *Беларускай антэклізы.* Асадкавы чахол складзены з адкладаў дэвонскага, мелавога, палеагенавага ўзросту. Антрапагенавыя ўтварэнні (магутнасць больш за 100 м) дняпроўскага, сожскага і паазерскага зледзяненняў. Рэльеф буйнаўзгорысты і градава-марэнна-азёрны, сфарміраваўся пераважна пад уплывам ледавіка паазерскага зледзянення. У фарміраванні паверхні вял. ролю адыграў актыўны ледавік (марэны напору, гляцыядыслакацыі, адорвені, ледавіковыя лагчыны), а таксама пасіўны («мёртвы»), які ўплываў на ўтварэнне камаў, озаў, тэрмакарставых і падпрудных азёрных катлавін. Адносныя перавышэнні рэльефу да 50—60 м. У паніжэннях і лагчынах паміж марэннымі градамі шмат невялікіх, глыбокіх азёр, размешчаных групамі (Лучайская, Мядзельская, Доўгаўская, Глыбоцкая) і злучаны пратокамі і малымі рэчкамі.

Тут знаходзіцца самае глыбокае на Беларусі воз. Доўгае (глыб. 53,7 м). Па градах праходзіць водападзел паміж бас. рэк Зах. Дзвіна і Нёман. На паўн. схілах пачынаюцца рэкі Мядзелка, Галбіца, Бярозаўка, Мнюта, Авута; на паўд. — Страча, Сэрвач. Карысныя выкапні: гліны легкаплаўкія, пясчана-жвіровы матэрыял, буд. пясок, торф, сапрапель. Глебы пераважна дзярнова-падзолістыя слаба- і сярэднепадзоленыя; месцамі эрадзіраваныя, у паніжэннях глеістыя, часам карбанатныя. Лясы захаваліся невял. ўчасткамі, займаюць каля 25% тэрыторыі. Пашыраны мяшаныя драбналістыя маладнякі і субаравыя хвойнікі, месцамі дубовыя і шыракаліста-яловыя асацыяцыі. У паніжэннях зараснікі вярбы, бярозы, хвоі, чорнай вольхі. Пад ворывам больш за 40% тэрыторыі, характэрна драбнаконтурнасць с.-г. угод-

СВЯНЦЯНСКІ ПРАРЫЎ 1915 г.



Аўтар А.М.Лукашэвіч

дзяў (пл. 3—4 га). Асаблівасці рэльефу садзейнічаюць праяўленню плоскаснага змыву глеб. У межах С.г. частка нац. парку *Нарачанскі*; заказнікі: ландшафтны *Блакітныя Азёры*, гідралагічныя *Доўгае* і *Белае*, біял. *Некасецкі, Рудакова, Пасынкі*.

В.П.Якушка

Свянцянскія грады ў Мядзельскім раёне Мінскай вобл.

СВЯРГУ́Н Аляксандр Рыгоравіч (30.12.1903, в. Гічыцы Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл. — 31.8.1971), дзеяч рэв. руху ў Зах. Беларусі. У 1923—27 чл. Косаўскага раённага, Слонімскага акр. к-таў КПЗБ; стварыў ячэйкі КПЗБ і КСМЗБ на Слонімшчыне; адзін з арганізатараў выступлення працоўных г. Косава ў абарону Бел. сял.-работніцкай грамады (гл. *Косаўскі расстрэл 1927*). У 1927—39 за рэв. дзейнасць зняволены польскімі ўладамі. Дэп. Нар. сходу Зах. Беларусі ў 1939. У Вял. Айч. вайну ў Чырв. Арміі, з 1943 у партызанах на Брэстчыне. З 1944 на сав. рабоце ў Брэсцкай вобл. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1941—47. Аўтар успамінаў аб рэв. руху ў Зах. Беларусі. Яго імем названа вуліца ў г. Пружаны.

М.П.Клімец.

СВЯРДЛО́ВА Роза Міронаўна (н. 25.10.1908, г. Віцебск), бел. і расійская кінаактрыса. Засл. арт. Беларусі (1935). Скончыла кінаадзяленне Ленінградскага тэатр. тэхнікума (1930, майстэрня Я.Чарвякова). З 1927 здымалася ў кіно. Выканаўца лірыка-драм. роляў. Створаным вобразам уласціва спалучэнне жыццёвай верагоднасці з гераіка-рамант. афарбоўкай характару гераіні. Знялася ў бел. фільмах: «Да заўтра» (1929), «Баям насустрач» (1932), «Залатыя агні» (1934), «Новая радзіма», «Шлях карабля» (абодва 1935), «Дачка Радзімы» (1937). Найб. значныя ролі ў маст. стужках на «Ленфільме»: «Дзяўчына з далёкай ракі» (1928), «Цана чалавека» (1929), «Каўказскі палоннік» (1930), «Кроў зямлі» (1931), «Адчайны батальён» (1933), «Нявеста» (1957).

В.А.Мядзведзева.

СВЯРДЛО́Ў Якаў Міхайлавіч (4.6.1885, г. Ніжні Ноўгарад, Расія — 16.3.1919), савецкі паліт. і дзярж. дзеяч. З сям'і рамесніка-гравёра, ураджэнца г. Полацк. Чл. РСДРП з 1901, бальшавік з 1903. З 1904 прафес. рэвалюцыянер. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07 на Урале. За рэв. дзейнасць 14 разоў арыштаваны, 12 гадоў прабыў у турмах і ссылках. Чл. ЦК і Рус. бюро ЦК (з 1912), сакратар ЦК партыі (з 1917). Адзін з кіраўнікоў кастр. ўзбр. паўстання 1917 у Петраградзе (гл. *Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917*). З 8.11.1917, застаючыся сакратаром ЦК партыі, старшыня ВЦВК Саветаў. Адзін з ініцыятараў «чырвонага тэрору» і «расказачвання». На пасяджэнні ЦК КП(б)Б 1.2.1919 абвясціў пастанову ЦК РКП(б) аб неабходнасці стварэння адзінай Літ.-Бел. Сацыялістычнай Рэспублікі, на 1-м Усебел. з'ездзе Саветаў (2—3.2.1919) абвясціў пастанову Прэзідыума ВЦВК аб прызнанні незалежнасці БССР. Адзін са стваральнікаў *Камуністычнага Інтэрнацыянала*.

СВЯРДЛО́ЎСК, назва г. *Екацярынбург* у 1924—91.

СВЯРДЛО́ЎСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на ўсх. схілах Сярэдняга і Паўн. Урала і зах. частцы Зах.-Сібірскай раўніны, у Расійскай Федэрацыі. Утворана 17.1.1934. Пл. 194,8 тыс. км^2. Нас. 4603 тыс. чал. (2000), гарадскога 87,6%. Цэнтр — г. *Екацярынбург*. Найб. гарады: Ніжні Тагіл, Каменск-Уральскі, Перваўральск, Сяроў, Азбест, Раўда.

Рэльеф Сярэдняга Урала слабахвалісты, найб. высокія вяршыні на Паўн. Урале — Канжакоўскі Камень (1569 м) і Дзенежкін Камень (1492 м). Уся Зах.-Сібірская раўніна займае $^2/_3$ тэр. вобласці. Карысныя выкапні: жал. і медныя руды, каменны і буры вугаль, азбест, тальк, мармур, золата, плаціна, каштоўныя камяні, торф і інш. Клімат кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад -20 °С на Пн да -15 °С на Пд, ліп. ад 16 °С на Пн да 19 °С на ПдУ. Ападкаў 350—600 мм за год. Асн. рэкі: Таўда, Тура, Ісець (бас. р. Об) і Чусавая, Уфа (бас. р. Кама). Глебы падзолістыя, дзярнова-падзолістыя, тарфяна-балотныя, у паласе лесастэпу шэрыя лясныя і чарназёмныя. Пад лесам каля 61% тэр. У горнай ч. пераважае цемнахвойная тайга, па нізкіх мясцінах — яловыя лясы з дамешкамі кедру. Шмат балот. На ПдУ лесастэп. Нац. парк Прыпышмінскія бары, запаведнікі Вісімскі і Дзенежкін Камень.

С.в. — адзін з найб. развітых прамысл. рэгіёнаў Расіі. У прам-сці (1999) вядучае месца належыць каляровай (31%) і чорнай (19,8%) металургіі, машынабудаванню (цяжкае, энергет., трансп. станкабудаванне, эл.-тэхн. і інш.) і металаапрацоўцы (15,7%), электраэнергетыцы (10,8%). Вытв-сць алюмінію, медзі, нікелю, пракату чорных металаў (3,4 млн. т), выплаўка сталі (5,4 млн. т). Вытв-сць пракатных станаў, абсталявання для доменных пячэй, нафтабуравых установак, буйных эл. машын, турбін, кормаўборачных камбайнаў, вагонаў, аўтапрычэпаў, матацыклаў, металарэзных станкоў, абсталявання для хім., лясной і дрэваапр. прам-сці, ваен. тэхнікі (танкаў, ракетных комплексаў, авіяц. оптыкі), падшыпнікаў, кабелю, трансфарматараў, халадзільнікаў, пыласосаў, пральных машын, радыёапаратуры і інш. Вытв-сць электраэнергіі 35,8 млрд. кВт · гадз. Белаярская АЭС, Верхнетагільская, Ніжнетурынская, Рафшінская, Сяроўская, Сярэднеўральская ДРЭС. Развіты коксахім., хім. (шыны, мінер. ўгнаенні, пластмасы, хім. рэактывы, гумава-тэхн. вырабы, лакі, фарбы) і хіміка-фармацэўтычная (антыбіётыкі), лясная і дрэваапр. (піламатэрыялы, фанера, мэбля, кардон, папера), буд. матэрыялаў, азбеставая, лёгкая і харч. прам-сць. Здабыча жал. і медных руд, золата, баксітаў, азбесту, тальку, вугалю, торфу. Вытв-сць ювелірных вырабаў з уральскіх самацветаў і вырабных камянёў. Сельская гаспадарка жывёлагадоўча-збожжавага кірунку. Гадуюць малочна-мясныя пароды буйн. раг. жывёлы, свіней, коз, авечак, птушак. Пасяўныя пл. займаюць 1,2 млн. га (1999).



Вырошчваюць пшаніцу, ячмень, авёс, шматгадовыя травы, кукурузу на сілас, караняплоды, бульбу і агародніну (пераважна вакол буйных гарадоў і на Пд вобласці). Даўж. чыгункі 3551 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 10,1 тыс. км. Асн. чыг. вузлы: Екацярынбург, Ніжні Тагіл, Сяроў, Каменск-Уральскі, Арцёмаўскі і інш. Суднаходства па р. Таўда і яе прытоках Лозьва і Сосьва і р. Тура. Газаправоды Урэнгой—Сяроў—Ніжні Тагіл—Екацярынбург, Бухара—Урал (да Екацярынбурга), транзітны газапровад Урэнгой—Памары—Ужгарад і нафтапровад Сургут—Перм—Ніжні Ноўгарад. Курорты: Абухава, Кур'і, Ніжнія Сяргі, Самацвет, Малтаева Возера.

СВЯРЧЭЎСКІ (Świerczewski) Кароль (псеўд. ген. Вальтэр; 22.2.1897, Варшава — 28.3.1947), дзяржаўны і ваенны дзеяч Польшчы, адзін з арганізатараў нар. Войска Польскага. Ген. броні. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1927). У 1-ю сусв. вайну эвакуіраваны ў Маскву. У 1917 добраахвотнік атрада Чырв. гвардыі, удзельнік Кастр. паўстання ў Маскве. У Чырв. Арміі ў 1918—36 і 1938—43. Удзельнік грамадз. вайны ў Расіі. Да 1936 на камандных і штабных пасадах (у 1927—28 у штабе БВА). У 1936—38 пад імем ген. Вальтэра камандаваў інтэрнац. брыгадай, потым дывізіяй у грамадз. вайне ў Іспаніі. У 1939—41 выкладаў у Ваен. акадэміі імя Фрунзе. У Вял. Айч. вайну з 1941 камандзір 248-й стралк. дывізіі на Зах. фронце. У 1943 удзельнічаў у арг-цыі Польскай арміі на тэр. СССР. Са жн. 1943 нам. камандзіра 1-га польскага корпуса, у сак.—жн. 1944 нам. камандуючага 1-й арміяй Войска Польскага. У вер. 1944 сфарміраваў 2-ю армію Войска Польскага, якая пад яго камандаваннем удзельнічала ў вызваленні зах. польскіх зямель і Чэхаславакіі. З лют. 1946 нам. міністра нац. абароны Польшчы. Забіты тэрарыстамі ў час інспекцыйнай паездкі ў Баліград (Польшча).

Літ.: Бранеўская Я. Пра чалавека, які не кланяўся кулям: Пер. з пол. Мн., 1968; Wadecka S.L. Generał Karol Świerczewski «Walter» 1897—1947. Warszawa, 1976; Сверчевские А. и М. Солдат трех армий. М., 1993.

СВЯРЫ́НАЎСКАЕ ВО́ЗЕРА. У Расонскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Расонка, за 7 км на Пд ад г.п. Расоны. Пл. 0,22 км², даўж. 820 м, найб. шыр. 430 м, даўж. берагавой лініі каля 2,1 км. Пл. вадазбору 2,75 км². Схілы катлавіны выш. 8—10 м, стромкія, пад лесам, на Пн спадзістыя, разараныя. Пойма забалочаная, пад хмызняком.

«СВЯ́ТА», бел. дзярж. ансамбль нар. музыкі. Створаны ў 1984 пры Бел. філармоніі. Арганізатар і маст. кіраўнік В.*Купрыяненка*, з 2001 — А.*Каштаналаў*. Уключае інстр. ансамбль (10 музыкантаў), вак. (4 спевакі) і танц. (4 выканаўцы) групы. У рэпертуары аўтэнтычныя і апрацаваныя бел. нар. песні і танцы, музыка і абрады з розных рэгіёнаў Беларусі, у т.л. «Цячэ вада ў ярок», «Ой, у полі крыніца», «Пасею гурочкі», віцебская і лядзецкая полькі, вак.-харэаграфічныя замалёўкі «Каханачка», «Лысы», вак.-інстр. кампазіцыя «Вяселле Магілёўшчыны і Палесся». Сярод выкарыстоўваемых бел. нар. інструментаў цымбалы, жалейка, акарына, колавая ліра, басэтля, саломка, дуда і інш. Лаўрэат Міжнар. маст. фестывалю садружнасці краін у Паўн. Карэі (г. Пхеньян, 1992). Пра «С.» зняты аднайм. кінафільм (1988). Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1988. *Н.Г.Мазурына.*

Ансамбль народнай музыкі **«Свята»**.

СВЯ́ТА ПЕРАМО́ГІ, Дзень Перамогі, усенароднае свята ў краінах СНД — удзельніцах Вял. Айч. вайны 1941—45, у т.л. ў Рэспубліцы Беларусь. Абвешчана Указам Прэзідыума Вярх. Савета СССР 8.5.1945 у гонар перамогі Сав. Саюза над фаш. Германіяй. Адзначаецца штогод 9 мая (з 1965 непрацоўны дзень).

СВЯ́ТА ЎРАДЖА́Ю, святкаванне заканчэння ўборкі ўраджаю. Першыя С.ў. прымяркоўвалі да Пакроваў — стараж. земляробчага свята заканчэння палявых работ. У ім прымалі ўдзел калектыўныя і аднаасобныя гаспадаркі; праводзілі яго ў школах, хатах-чытальнях, нар. дамах, на плошчах. У падрыхтоўцы свята ўдзельнічалі выканкомы мясц. Саветаў, парт., камсамольскія, прафс. арг-цыі. Асн. мэта першых С.у. — прапаганда с.-г. вопыту. Суправаджалася выстаўкай узораў с.-г. прадукцыі, прылад працы, паказам прыёмаў апрацоўкі і ўгнаення глебы і інш. У час свята дэманстравалі апрацоўку глебы трактарам, арганізоўвалі выстаўку калгаснай прадукцыі, кірмашы. Састаўнымі элементамі С.ў. былі маст. інсцэніроўкі, канцэрты, танцы, гульні, спаборніцтвы (у прыватнасці, конныя), часам карнавальныя шэсці. Высокі эмац. настрой свяцу надавалі духавыя аркестры. Мастацкія рысы С.ў. ўзмацніліся ў 1960—90-я г. Яно ўзбагацілася традыц. сімваламі дажыначных абрадаў (апошні сноп жыта, ячменю, заканчэння ўборкі ўраджаю, днём падвядзення вынікаў працы, ушанавання пераможцаў. *В.Ф.Бацяеў, М.Ф.Піліпенка.*

«СВЯ́ТА ЎРАДЖА́Ю» («Erntefest»), кодавая назва карнай аперацыі ням. фашыстаў супраць партызан і мясц. насельніцтва ў Грэскім, Капыльскім, Пухавіцкім, Слуцкім і Уздзенскім р-нах Мінскай вобл. ў Вял. Айч. вайну ў студз.—лютым 1943. Праводзілася на У і З ад аўтадарогі Мінск—Слуцк 13-м паліцэйскім палком СС, батальёнам СС Дырлевангера, 11 ахоўнымі і паліцэйскімі батальёнамі, 3 камандамі СД у складзе эйнзатцгрупы паліцыі бяспекі і СД генеральнай акругі «Беларусь». Спроба гітлераўцаў акружыць і знішчыць партыз. фарміраванні правалілася, таму што ўмелымі тактычнымі манеўрамі партызаны выйшлі з блакіраваных раёнаў. У час аперацыі карнікі расстралялі 4325 чал., вывезлі ў Германію больш за 1300 чал., спалілі дзесяткі вёсак, у т.л. Жавалкі (загубілі 512 чал.), Калодзезнае (196 чал.) Капыльскага, Адамова (190 чал.) Слуцкага р-наў; захапілі і вывезлі больш за 2800 галоў буйн. раг. жывёлы, 1500 авечак, 438 т збожжа, вял. колькасць насення лёну і канапель, шкур і інш. *У.С.Пасэ.*

СВЯТАВІ́Т, Свентавіт, Светавіт, язычніцкае божаства ў зах.-славянскай міфалогіі. Ушаноўваўся таксама як бог вайны і дастатку. Увасабляўся ў выгля-

дзе чатырохгаловага ці чатырохтварага ідала. Атрыбуты С. — белы конь, меч і коп'і. У г. Аркон на в-ве Руген (Германія) знаходзіўся культавы цэнтр С. — чатырохслуповы храм-свяцілішча (разбураны ў 1168).

СВЯТАГО́РСКІ МАНАСТЫ́Р, помнік архітэктуры 16—19 ст. у г.п. Пушкінскія Горы Пскоўскай вобл. (Расія). Засн. ў 1569 як мужчынскі. Размяшчаецца на Святых (б. Сінічых) гарах. Ансамбль манастыра абнесены пабеленымі каменнымі сценамі і Анастасіеўскай і Святой брамамі. На вяршыні ўзгорка — мураваны 4-стаўповы 3-апсідны 1-купальны Успенскі сабор (16 ст.) з традыц. рысамі *Пскоўскай школы дойлідства*. У ветразевых скляпеннях і верхняй ч. праслаў сабора ўстаноўлены галаснікі. У ансамблі С.м. званіца ў стылі класіцызму (скончана ў 1821; у яе верхнім ярусе размяшчаўся гадзіннік), брацкі корпус з трапезнай, гасцініца. На тэр. манастыра магіла А.С.Пушкіна і яго продкаў. Пасля 1918 у саборы была экспазіцыя, прысвечаная Пушкіну. У Вял. Айч. вайну манастыр моцна пашкоджаны. Адноўлены. З 1990-х г. храм дзейнічае. С.м. уваходзіць у склад Музея-запаведніка Пушкіна. *Г.А.Лаўрэцкі.*

СВЯТАПО́ЛК ІЗЯСЛА́ВІЧ (у хрышчэнні Міхаіл; 8.11.1050 — 16.4.1113), князь полацкі, тураўскі, вял. князь кіеўскі. Сын вял. кн. *Ізяслава Яраславіча*, унук *Яраслава Мудрага*. У 1069 бацька прызначыў яго на полацкае княжанне замест памерлага *Мсціслава Ізяславіча*. У 1071 яго выгнаў з Полацка *Усяслаў Брачыславіч*. У 1073 С.І. разам з бацькам уцёк за межы Русі, дзе быў да 1077. Пасля вяртання атрымаў ад бацькі ў трыманне Наўгародскую зямлю. У 1088 «иде Святополк из Новагорода к Турову жити» — верагодна, у С.І. адбыўся нейкі канфлікт з наўгародцамі. 24.4.1093 заняў велікакняжацкі пасад у Кіеве, якім валодаў да смерці. Рабіў шматразовыя паходы на полаўцаў. Адзін з ініцыятараў *Любецкага з'езда 1097*, згодна з пастановай якога «яко князь туровский» атрымаў вял. тэрыторыі «об оне стороне Припети» з Туравам, Пінскам, Бярэсцем і Пагарыннем, а таксама Кіеўскае княства і Наўгародскую зямлю (аднак наўгародцы не прызнавалі яго ўлады). У самым канцы 11 ст. ён авалодаў Уладзіміра-Валынскім княствам. Трымаў у Кіеве тураўскую дружыну. У 1104 пасылаў свайго ваяводу Пуцяту на менскага кн. *Глеба Усяславіча*. Захавалася паданне, што 2-я жонка С.І. грачанка Варвара заснавала ў Тураве жаночы манастыр. *В.С.Пазднякоў.*

СВЯТАПО́ЛК МСЦІСЛА́ВІЧ (?—1154), князь уладзіміра-валынскі. Сын вял. кн. *Мсціслава Уладзіміравіча*. З 1132 княжыў у Полацку пасля брата Ізяслава, які перайшоў у Пераяслаў. Аднак палачане прагналі яго, заявіўшы «лишается нас», і абралі князем *Васільку Святаславіча*. З 1138 пасля смерці старэйшага брата Усевалада С.М. княжыў у Пскове. У 1140 атрымаў ад вял. кн. Усевалада Ольгавіча Бярэсце, а ў 1142 перайшоў княжыць у Ноўгарад. У 1148 атрымаў ад вял. кн. Ізяслава Мсціславіча Уладзіміра-Валынскае княства, якім валодаў да смерці. *В.С.Пазднякоў.*

СВЯТАПО́ЛК УЛАДЗІ́МІРАВІЧ (у хрышчэнні Пётр, мянушка Акаянны; каля 980—1019), князь тураўскі і вял. князь кіеўскі; гл. *Святаполк Яраполчыч*.

СВЯТАПО́ЛК ЮР'ЕВІЧ (? — 19.4.1190), князь тураўскі. Сын тураўскага кн. *Юрыя Яраславіча*. Упершыню ўпамінаецца ў 1156, калі князь Яраслаў Уладзіміравіч Асмамысл пасылаў С.Ю. да вял. кн. Юрыя Далгарукага прывесці ў Галіч зняволенага кн. Івана Расціславіча Бярладніка. Як князь тураўскі С.Ю. вядомы з 1162, калі хадзіў разам з інш. князямі выганяць са Слуцка Уладзіміра Мсціславіча. У 1168 С.Ю. удзельнічаў у вял. паходзе вял. кн. Мсціслава Ізяславіча на полаўцаў. У 1170 дапамагаў выгнанаму з Кіева Мсціславу Ізяславічу вярнуць свой трон. С.Ю. пахаваны ў Кіеве ў Міхайлаўскім Залатаверхім саборы. *В.С.Пазднякоў.*

СВЯТАПО́ЛК ЯРАПО́ЛЧЫЧ (у хрышчэнні Пётр, мянушка Акаянны; каля 980—1019), князь тураўскі і вял. князь кіеўскі. Прыёмны сын вял. кн. *Уладзіміра Святаславіча*. Нарадзіўся ад шлюбу вял. кн. Яраполка Святаславіча з «грэкіняй», якую пасля забойства мужа яшчэ цяжарнай узяў за жонку Уладзімір (С.Я. называюць таксама Святаполк Уладзіміравіч). У 988 С.Я. атрымаў ад айчыма тураўскае княжанне. У пач. 11 ст. рыхтаваў змову супраць Уладзіміра, аднак яна была раскрыта. С.Я. разам з жонкай, дачкой польскага князя (пазней караля) Баляслава I Храбрага і яе духоўнікам, калобжагскім біскупам Рэйнбернам, апынуўся ў кіеўскай турме. Пагроза вайны з Баляславам прымусіла Уладзіміра выпусціць зняволеных, але ён не адпусціў іх у Тураў. Спачатку С.Я. жыў у Кіеве, потым у Вышгарадзе. Пасля смерці Уладзіміра (1015) С.Я. заняў кіеўскі трон. Паводле «Аповесці мінулых гадоў» ён рукамі наёмных забойцаў пазбавіўся сваіх канкурэнтаў на ўладу, сыноў Уладзіміра — Барыса, Глеба і Святаслава, за што атрымаў мянушку Акаянны. У адказ наўгародскі кн. Яраслаў Мудры выступіў з войскам у паход на Кіеў. У бітве каля Любеча (1015 або 1016) С.Я. пацярпеў паражэнне і ўцёк да цесця ў Польшчу. Ісландская «Сага аб Эймундзе» адказнасць за забойствы ускладае на Яраслава Мудрага. У 1018 войскі С.Я. і Баляслава Храбрага ў бітве каля Бярэсця разбілі дружыну Яраслава. С.Я. зноў заняў кіеўскі трон, але ненадоўга. Наўгародскае войска Яраслава падышло да Кіева і прымусіла С.Я. ўцячы. У 1019 выгнанец вадзіў на Кіеў войска печанегаў. Вырашальная бітва адбылася на р. Альта. С.Я. у другі раз адправіўся ў Польшчу, але па дарозе памёр.

Літ.: Филист Г.М. История «преступлений» Святополка Окаянного. Мн., 1990.

А.В.Іоў.

СВЯТАПО́ЛК-МІ́РСКІ Пётр Дзмітрыевіч (30.8.1857 — 29.5.1914), расійскі ваенны і дзярж. дзеяч. Ген. ад кавалерыі (1913). Ген.-ад'ютант (1904). З роду князёў Святаполк-Мірскіх (гл. *Мірскія*). Скончыў Пажскі корпус (1875), Акадэмію Генштаба (1881). Удзельнік рус.-турэцкай вайны 1877—78. З 1895 пензенскі, з 1897 екацярынаслаўскі губернатар. У 1900—02 таварыш (намеснік) міністра ўнутр. спраў і камандуючы асобым корпусам жандараў. У 1902—04 віленскі, гродзенскі і ковенскі ген.-губернатар. Надаваў значэнне развіццю сярод беларусаў нац. самасвядомасці, увядзенню ў бел. каталіцкія парафіі набажэнства на роднай мове. Прызначаў беларусаў-католікаў на некат. чыноўніцкія пасады. Падтрымліваў выдавецкую дзейнасць *Віленскай археаграфічнай камісіі*. У жн. 1904 прызначаны міністрам унутр. спраў. З мэтай аслаблення рэв. руху імкнуўся прыцягнуць на бок урада бурж.-ліберальную апазіцыю (дазволіў з'езды земскіх дзеячаў, правёў частковую амністыю паліт. зняволеным, аслабіў цэнзуру і інш.). У 1905 пасля студзеньскага расстрэлу рабочай дэманстрацыі (гл. *«Крывавая нядзеля»*) С.-М. звольнены ў адстаўку. *А.М.Лукашэвіч.*

СВЯТА́Р, сан 2-й (сярэдняй) ступені свяшчэнства ў праваслаўнай, каталіцкай і стараж.-ўсходніх цэрквах. Паводле царк. дагматыкі, С. мае дар божы Св. Духа, які дае яму магчымасць здзяйсняць царк. таінствы (акрамя таінства свяшчэнства), царк. службы і даваць вернікам божае бласлаўленне. Пасвячае ў С. *епіскап*. У правасл. царкве, дзе гэты тэрмін найб. пашыраны, С. таксама наз. іерэй, *прэсвітэр*, поп. Правасл. С. павінен быць абавязкова жанаты ці прыняць манаства (С.-манах наз. іераманах). Старшы С., звычайна кіраўнік ніжэйшай царк. акругі (благачыння) ці настаяцель сабора, мае ганаровае званне (*протапрэсвітэр*, пратапоп, у манастве — *ігумен, архімандрыт*). Каталіцкага С. ў Беларусі, Літве, Польшчы, Украіне наз. ксёндз. Гл. таксама *Духавенства*.

СВЯТАСЛА́Ў ІВА́НАВІЧ (? — 29.4.1386), вялікі князь смаленскі з 1358. Сын вял. кн. смаленскага Івана Аляксандравіча. Праводзіў палітыку па захаванні незалежнасці *Смаленскага княства*. Спрабаваў вярнуць захопленыя вял. кн. *Альгердам* паволжскія землі (паход 1358 на р. Белая), але ў выніку страціў Мсціслаў з Пасожжам (1359). Дружына С.І. ў 1368 і 1370 прымала ўдзел у *паходах Альгерда на Маскву 1368—72*. За парушэнне дагавора з Масквой у 1368 С.І. быў адлучаны мітрапалітам Алексіем ад царквы, што пацвердзіў у 1370 канстанцінопальскі патрыярх. У 1375 заключыў саюзны дагавор з Масквой і ўдзельнічаў у паходзе супраць Цверы. У 1386 разам з

Андрэем Альгердавічам пачаў барацьбу супраць Вільні і спрабаваў вярнуць захопленыя ВКЛ паўн.-зах. воласці Смаленскага княства. Пасля няўдалай аблогі Віцебска і Оршы спрабаваў узяць Мсціслаў. 29 крас. пад сценамі горада адбылася бітва з падышоўшым войскам ВКЛ, у якой С.І. быў разбіты (гл. *Мсціслаўская бітва 1386).* *А.А.Мяцельскі.*

СВЯТАСЛА́Ў ІГАРАВІЧ (? — 972), вялікі князь кіеўскі [964—972]. Паводле *«Аповесці мінулых гадоў»*, сын вял. князя кіеўскага *Ігара.* У 964—966 вызваліў *вяцічаў* ад улады хазар і падначаліў іх Кіеву. У 960-я г. разграміў *Хазарскі каганат*, разбурыў яго сталіцу Ітыль і г. Саркел (на Доне). Ваяваў з *Балгарыяй волжска-камскай* і захапіў яе сталіцу Булгар. На Паўн. Каўказе заваяваў хазарскую крэпасць Семендэр, разбіў ясаў і касогаў. У 967 увараваўся ў Дунайскую Балгарыю і ўмацаваўся ў г. Пераяславец у вусці Дуная. Калі на Кіеў напалі печанегі, вярнуўся, разбіў іх і зноў прыйшоў у Балгарыю. Каля 971 у саюзе з балгарамі і венграмі ваяваў супраць Візантыі. У 971 заключыў мір з візантыйскім імператарам Іаанам I Цымісхіем. На шляху да Кіева каля дняпроўскіх парогаў загінуў у баі з печанегамі.

Літ.: Рыбаков Б.А. Древняя Русь: Сказания. Былины. Летописи. М., 1963; Сахаров А.Н. Дипломатия Святослава. 2 изд. М., 1991.

СВЯТАСЛА́Ў МСЦІСЛА́ВІЧ (у хрышчэнні Сімяон), наўгародскі, полацкі і смаленскі князь у 1-й пал. 13 ст. Сын *Мсціслава Раманавіча.* У 1218—19 княжыў у Ноўгарадзе. З 1222 (ці з 1223) полацкі князь. У 1232 «взя Святослав Мьстиславичь, внук Романов Смоленск на щит с полочаны на память святых мучеников Бориса и Глеба, исече смолян много, а сам седе на столе». Верагодна, знаходзіўся на смаленскім прастоле да 1239, калі яго змяніў брат Усевалад. Звесткі пра яго далейшы лёс адсутнічаюць. *А.А.Мяцельскі.*

СВЯТАСЛА́Ў МСЦІСЛА́ВІЧ (? — 1172), князь уладзіміра-валынскі і берасцейскі. Сын вял. кн. Мсціслава Ізяславіча. Упершыню ўпамянёны ў Іпацьеўскім летапісе пад 1173 (сапраўдная дата падзеі 1170), калі сын Яраслава Асмамысла Уладзімір звярнуўся да яго з просьбай дазволіць уладарыць у г.Чэрвень. Мяркуецца, што ў гэты час С.М. княжыў ва Уладзіміры-Валынскім, а яго старэйшы брат Раман — у Ноўгарадзе. У гісторыка 18 ст. В.М.Тацішчава пад 1172 ёсць запіс пра смерць С.М. ў Бярэсці. Верагодна, туды С.М. перайшоў княжыць у 1170. *В.С.Пазднякоў.*

СВЯТАСЛА́Ў О́ЛЬГАВІЧ (у хрышчэнні Мікалай; ? —15.2.1164), князь чарнігаўскі. Сын Алега Святаславіча. У 1136 запрошаны ў Ноўгарад, дзе княжыў з перапынкамі да 1141. У 1142 меў нейкую волась «около Гомья» (Гомеля). У 1146 яму належалі Курск, Ноўгарад-Северскі, Карачаў, Колдеск, Дзедаслаў, але ў тым жа годзе ён выгнаны з Чарнігаўскай і Северскай зямель. У 1147 увайшоў у саюз з Юрыем Далгарукім, з дапамогай яго войск заняў зямлю вяцічаў, пасля вярнуў свае ўладанні. Калі Юрый Далгарукі заняў Кіеў (1149), С.О. атрымаў ад яго «и Случеск, и Клеческ, и вси Дрегвиче» (Слуцк і Клецк з навакольнымі землямі), а каля 1155 — Мазыр. Паводле дагавора 1157 з вял. кіеўскім кн. Ізяславам Давыдавічам атрымаў Чарнігаўскую зямлю, а г. Ноўгарад-Северскі перадаў пляменніку Святаславу Усеваладавічу. Некат. час у яго землях знаходзіўся пазбаўлены ўладанняў полацкі кн. *Рагвалод Барысавіч*, якому С.О. у 1158 дапамог войскамі вярнуць свае землі. *В.С.Пазднякоў.*

СВЯТАСЛА́Ў УСЕ́ВАЛАДАВІЧ (у хрышчэнні Міхаіл; пасля 1116 — 27.7.1194), князь тураўскі, вял. князь кіеўскі. Сын вял. кн. Усевалада Ольгавіча. У 1140 пасланы бацькам княжыць у Ноўгарад, аднак там яго не прынялі. Каля 1142 бацька пасадзіў яго ў Тураве, але хутка туды з Пераяслава пераведзены *Вячаслаў Уладзіміравіч*, а С.У. атрымаў Уладзімір-Валынскі. У 1146 па загадзе вял. кн. *Ізяслава Мсціславіча* С.У. разам з Расціславам Мсціславічам выгнаў Вячаслава Уладзіміравіча з Турава. Пасля смерці Ізяслава Мсціславіча (1154) С.У. пільнаваў Кіеў, пакуль туды не прыйшоў княжыць Расціслаў Мсціславіч; за гэту паслугу атрымаў ад яго Тураў і Пінск, аднак праз год іх страціў. У 1162 удзельнічаў разам з інш. князямі ў паходзе на Слуцк супраць Уладзіміра Мсціславіча. У 1164 захапіў Чарнігаўскае княства, а свайго сына Алега паслаў у Гомель. У 1176—94 вял. кн. кіеўскі. У 1180 з наўгародскім войскам удзельнічаў у вял. кааліцыйным паходзе на Друцк, спаліў там астрог. З 1143 жанаты з дачкой полацкага кн. *Васількі Святаславіча* Марыяй. *В.С.Пазднякоў.*

СВЯТАСЛА́Ў УСЯСЛА́ВІЧ (у хрышчэнні Георгій), князь у Полацкай зямлі ў 12 ст. Сын полацкага кн. *Усяслава Брачыславіча.* Згадваецца пад 1129 сярод сыноў Усяслава, якіх кіеўскі кн. *Мсціслаў Уладзіміравіч* саслаў у Візантыю. На думку А.Я.Праснякова і Т.Васілеўскага, С.У. у пач. 12 ст. валодаў Віцебскам, бо ў далейшым віцебскі сталец займалі яго ўнукі. Л.В.Аляксееў мяркуе, што Віцебск у гэты час належаў смаленскім князям. На думку А.М.Рапава, С.У. магло належаць Ізяслаўскае княства, бо пасля там княжыў яго сын *Васількa Святаславіч.* Меў сыноў Васіля, Давыда і Вячаслава, дачок Прадславу (*Ефрасінню Полацкую*) і Градзіславу (Еўдакію). *Л.У.Калядзінскі.*

СВЯТАСЛА́Ў ЯРАСЛА́ВІЧ, Святаслаў II (1027—76), князь чарнігаўскі [1054—73], вял. кн. кіеўскі [1073—76]. Сын *Яраслава Мудрага.* Разам з братамі *Усеваладам Яраславічам* і *Ізяславам Яраславічам* стварылі своеасаблівы княжацкі трыумвірат, які ў 1054—72 кіраваў усімі справамі на Русі. У 1060 С.Я. хадзіў на торкаў (у паходзе ўдзельнічаў і полацкі кн. *Усяслаў Брачыславіч* з дружынай). У пач. 1067 браты Яраславічы перамаглі на р. Няміга кн. Усяслава Брачыславіча (гл. *Нямігская бітва 1067).* Летам таго ж года «на Рші у Смаленска» браты прапанавалі Усяславу Брачыславічу правесці перагаворы. Аднак, нагледзячы на тое, што «цалавалі крыж чэсны Усяславу», па-здрадніцку захапілі яго і разам з сынамі пасадзілі ў турму-поруб у Кіеве. У 1068 браты пацярпелі няўдачу ад полаўцаў на р. Альта (каля Пераяслава), аднак неўзабаве С.Я. разбіў іх каля Сноўска. Разам з братамі з'яўляецца адным са складальнікаў *Рускай праўды* (т. зв. Праўды Яраславічаў). У 1073 пры падтрымцы Усевалада адабраў у старэйшага брата Ізяслава велікакняжацкі трон. Па заказе С.Я. ў 1073 і 1076 былі складзены *Ізборнікі Святаслава.*

СВЯТА́Я ВО́ЛЯ, вёска ў Іванцэвіцкім р-не Брэсцкай вобл., на аўтадарозе Іванцэвічы—Целяханы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 33 км на ПдУ ад горада і чыг. ст. Іванцэвічы, 169 км ад Брэста. 567 ж., 270 двароў (2001). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Свята-Крыжаўзвіжанская царква (1992). Магіла ахвяр фашызму. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

Вядома з 17 ст. як вёска ў Пінскім пав.; належала Дольскім, Вішнявецкім, Агінскім. 23.11.1724 кароль Аўгуст II надаў вёсцы правы мястэчка. З 1793 у складзе Рас. імперыі, мястэчка Пінскага пав. Мінскай губ. У 1886 цэнтр воласці, 448 ж., 44 двары, школа, царква. У 1920—39 у складзе Польшчы, цэнтр гміны Косаўскага пав. Палескага ваяв., 615 ж. (1921). З 1939 у БССР, з 1940 цэнтр сельсавета ў Целяханскім р-не Пінскай, з 1954 — Брэсцкай вобл., у 1959—62 і з 1965 у Іванцэвіцкім р-не, у 1962—65 у Бярозаўскім р-не.

СВЯТА́Я ГАРА́, назва *Дзяржынскай гары* да 1958.

СВЯТА́Я ТРО́ЙЦА, паводле хрысціянскага веравучэння, 3 іпастасі адзінага па сваёй сутнасці Бога: Бог-Айцец, Бог-Сын, Бог—Дух Святы. Вытокі вучэння пра С.Т. ў Старым запавеце, але канчаткова яно выкладзена ў Новым запавеце. Догмат пра С.Т. распрацоўваўся з канца 2 ст. ў сувязі з фарміраваннем адзінай епіскапальнай царквы і выклікаў вострыя дыскусіі (т. зв. трынітарныя спрэчкі). Тэалагічную завершанасць догмат пра С.Т. атрымаў у 3 ст. і замацаваны на 1-м (325) і 2-м (381) Усяленскіх саборах. У 381 уведзена свята Тройца (гл. *Сёмуха*). Вучэнне пра С.Т. распрацоўваў *Аўгусцін* Блажэнны, які трактаваў С.Т. як вечнае божае самапазнанне і любоў. Догмат пра С.Т. адмаўляўся ў антытрынітарных вучэннях (гл. *Антытрынітарыі*). С.Т. з'яўляецца адным з самых распаўсюджаных сюжэтаў у іканапісе. Сімвал С.Т. — выява 3 анёлаў.

СВЯТАЯ́ННІК, зверабой (H.urepicum), род кветкавых раслін сям. святаяннікавых, або зверабойных. Больш за 300 відаў. Пашыраны ва ўмераных і субтрапічных паясах і ў гарах тропікаў. На Беларусі 8 відаў. Найб. вядомыя С.: плямісты (H.maculatum), нар. назвы святаянскае зелле, крывавец, сямёнава кроў і прадзіраўлены (H.perforatum), нар. назвы зелле св. Івана, расанкі, кроўка. Вельмі рэдка трапляюцца С.: вялікі (H.majus), горны (H.montanum), зграбны (H.elegans), распасцёрты (H.humifusum), чатырохкрылы (H.tetrapterum), цвёрдаваласісты (H.hirsutum). Растуць у ліставых і мяшаных лясах, на палях, сухадольных лугах, уздоўж узлескаў. Інтрадукавана каля 7 відаў.

Адна- і шматгадовыя травы, кусты, паўкусты і нявял. дрэвы. Сцёблы звычайна прамыя, галінастыя. Лісце суцэльнае, супраціўнае або ў кальчаках, з кропкавымі залозкамі. Кветкі залаціста-жоўтыя, у мяцёлчатых, гронка- ці шчыткападобных суквецціях. Плод — каробачка. Лек., фарбавальныя, дубільныя, харч., меданосныя і дэкар. расліны. Некат. віды ядавітыя для авечак і коней. *А.М.Скуратовіч.*

Святаяннік прадзіраўлены.

СВЯ́ТКІ, святыя дні, дні [з 25 снеж. (7 студз.) да 6(19) студз.], установленыя правасл. царквою ў гонар нараджэння і хрышчэння Ісуса Хрыста.

СВЯТЛАБО́ЯЗЬ, фотафобія, павышаная адчувальнасць *вока* да светлавога раздражнення. Звычайна звязана з раздражненнем канчаткаў трайчастага нерва. Характэрная клінічная прыкмета розных паталаг. працэсаў пярэдняга адзела вока — *кан'юнктывітаў, кератытаў*, пашкоджанняў рагавіцы і інш. Часта С. суправаджаецца балючасцю, слёзацячэннем. Бывае ад яркага сонца.

СВЯТЛАВО́Д, святлапровад, хвалявод аптычны, закрытае ўстройства для накіраванай перадачы светлавой энергіі.

У адкрытай прасторы перадача светлавой энергіі магчыма толькі ў межах прамой бачнасці і звязана са стратамі, абумоўленымі пач. разыходнасцю выпрамянення, яго паглынаннем і рассеяннем у атмасферы. Выкарыстанне С. дае магчымасць значна зменшыць страты светлавой энергіі, а таксама перадаваць яе па крывалінейных трасах. Паводле канструкцыі адрозніваюць С. лінзавыя, валаконныя, планарныя, палоскавыя і інш. Лінзавыя С. — сістэма размешчаных у трубе лінзаў, якія служаць для перыядычнай карэкцыі хвалевага фронту светлавога пучка. Найб. распаўсюджаны валаконныя С. (гл. *Валаконная оптыка*). Для патрэб *інтэгральнай оптыкі* распрацаваны планарныя і палоскавыя С. — тонкая (парадку даўжыні светлавой хвалі) празрыстая святловядучая плёнка, нанесеная на аднародную падложку. Паказчык пераламлення плёнкі большы, чым паказчык пераламлення падложкі і асяроддзя над С. Светлавая хваля ў такім С. распаўсюджваецца ў працэсе шматкратнага поўнага адбіцця ад яго сценак. Палоскавыя С. адрозніваюцца ад планарных шырынёй (сувымерная з даўжынёй светлавой хвалі).

Літ.: Унгер Х.-Г. Планарные и волоконные оптические волноводы: Пер. с англ. М., 1980; Волоконно-оптические системы передачи. М., 1992. *Я.В.Алішаў.*

СВЯТЛАМУ́ЗЫКА, колерамузыка, розныя віды сінтэзу музыкі і святла (колеру, выявы, прасторава арганізаванага святла). Дасягненне вобразнага адзінства ў святломуз. сінтэзе стала магчымым пры засваенні прыёмаў слыхазрокавай поліфаніі. Першыя маст. эксперыменты — у пач. 20 ст.: сімф. паэма «Праметэй» А.Скрабіна (1910), опера «Шчаслівая рука» А.Шонберга (1913). Пашырылася з 1950-х г. у розных відах муз. шоу.

Я.Ф.Святланаў.

СВЯТЛА́НАЎ Яўген Фёдаравіч (н. 6.9.1928, Масква), расійскі дырыжор, кампазітар, піяніст. Нар. арт. СССР (1968). Герой Сац. Працы (1986). Скончыў Муз.-пед. ін-т імя Гнесіных у Маскве (1951), Маскоўскую кансерваторыю (1955). З 1955 дырыжор, у 1963—65 гал. дырыжор Вял. т-ра ў Маскве (сярод пастановак: «Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава, «Чарадзейка» П.Чайкоўскага, «Не толькі каханне» Р.Шчадрына, балеты «Сцежкаю грому» К.Караева, «Начны горад» на муз. Б.Бартака і інш.). У 1965—2000 маст. кіраўнік і гал. дырыжор Дзярж. сімф. аркестра Расіі (з 1992 — Дзярж. сімф. аркестр пад кіраўніцтвам С.). Першы выканаўца многіх твораў сав. і замежных кампазітараў («Жанна д'Арк на вогнішчы» А.Анегера, 7-я сімфонія Г.Малера, шэраг твораў І.Стравінскага, Бартака, А.Веберна і інш.). Стварыў унікальную «Анталогію рускай сімфанічнай музыкі ў грамзапісе». Аўтар сімфоній, сімф. паэм «Даўгава», «Святочная», «Каліна чырвоная» (памяці В.Шукшына), «Рамантычныя балады», тв. для фп., для скр. з арк., камерна-інстр. ансамбляў, хароў, рамансаў і інш. Ленінская прэмія 1972, Дзярж. прэмія Расіі 1975, Дзярж. прэмія СССР 1983.

Літ. тв.: Музыка сегодня. 3 изд. М., 1985.
Літ.: Крылова Л.Л. Е.Светланов. М., 1986; Евгений Светланов: Дирижер, композитор, пианист. М., 1987; Чумакова И.С. Евгений Светланов: Кто он прежде всего? М., 1997. *Л.А.Шымановіч.*

СВЯТЛАПРО́ВАД, тое, што *святлавод*.

СВЯТЛАСІ́ЛА, фізічная велічыня, роўная адносінам асветленасці відарыса прадмета, утворанага аптычнай прыладай, да яркасці прадмета; характарыстыка аптычнай прылады. Часам за С. прымаюць лікавае значэнне адноснай адтуліны — адносін дыяметра найб. дыяфрагмы аб'ектыва да яго фо-

куснай адлегласці. Для аб'ектыва С. прымаецца роўнай $\tau S/f^2$, дзе $\tau < 1$ — каэфіцыент прапускання аб'ектыва, залежны ад страт, звязаных з *адбіццём святла* і *паглынаннем святла*, S — плошча адтуліны апертурнай дыяфрагмы, f — фокусная адлегласць аб'ектыва.

СВЯТЛАТЭ́ХНІКА, галіна навукі і тэхнікі, якая займаецца даследаваннем прынцыпаў і распрацоўкай спосабаў генерыравання, прасторавага размеркавання, вымярэння і выкарыстання аптычнага (інфрачырвонага, бачнага, ультрафіялетавага) *выпрамянення*. Звязана таксама з пераўтварэннем *святла* ў інш. віды энергіі (напр., у оптаэлектроніцы).

Бывае: асвятляльная — выкарыстанне святла для асвятлення жылых, вытворчых і інш. памяшканняў, распрацоўка штучных *крыніц святла*, *асвятляльных прылад*, святлотэхнічных матэрыялаў, нарміраванне, праектаванне і эксплуатацыя святлотэхн. установак; святлосігнальная — аптычная *сігналізацыя*, распрацоўка святлосігнальных прыстасаванняў і сістэм кіравання імі (гл. *Аптычная лакацыя*, *Аптычная сувязь*, *Маяк*, *Святлафор*); святлопраекцыйная — атрыманне светлавых праекцый, *святлокапіраванне*, *святламузыка* (гл. *Капіравальна-размнажальная тэхніка*, *Праекцыйны апарат*); апрамяняльная — уздзеянне бачнага і нябачнага святла на чалавека, жывёл, расліны, вытв. працэсы (штучнае *апрамяненне арганізма* з лячэбнымі мэтамі, *святлолячэнне*, абеззараджванне вады і харч. прадуктаў, сушка пакрыццяў, вырошчванне пры штучным асвятленні агародніны, садавіны і інш.); вымяральная — вымярэнне характарыстык аптычнага выпрамянення (гл. *Колераметрыя*, *Фотаметрыя*); будаўнічая — выкарыстанне святла ў буд-ве і архітэктуры, яго размеркаванне ў будынках, на плошчах, гар. ансамблях; С. кінематаграфіі — распрацоўка і выкарыстанне спец. крыніц святла, асвятляльных прылад, экранаў для *кіназдымкі*, капіравання фільмаў і кінапраекцыі (гл. *Кіназдымачны апарат*). Для канцэнтрацыі светлавога патоку ў патрэбных кірунках выкарыстоўваюць *свяцільні* з люстранай і прызматычнай оптыкай; для памяншэння асляпляльнага дзеяння святла — розныя адбівальнікі і рассейвальнікі (дыфузныя і прызматычныя); для вял. канцэнтрацыі светлавога патоку — люстэркі рознай формы (напр., у *пражэктарах*); для атрымання звышмагутных накіраваных светлавых пучкоў — *лазеры*.

Стараж. крыніцы святла — вогнішчы, запаленыя трэскі і факелы (з наматаным на канцы палкі прасмоленым пакуллем), лучынныя святцы і *лучнікі*, неглыбокія каменныя міскі і гліняныя чашы на паддонах, у Стараж. Грэцыі і Рыме — гліняныя і бронзавыя свяцільні, лампады, у якія налівалі аліўкавы алей. Пазней з'явіліся свяцільні з 2 адтулінамі — для кнота і наліванне тлушчу або алею (на Беларусі наз. *каганцы*), шмат'ярусныя гліняныя сподкі, свечачныя лампады. У пач. 19 ст. з'явіліся асвятляльныя *лямпы*, у якіх

Некаторыя з асноўных крыніц святла ў гістарычным развіцці **святлатэхнікі**: 1 — факелы (з тлушчам і маслам); 2 — масляны свяцільнік у выглядзе лодкі (Стараж. Грэцыя, 5 ст. да н.э.); 3 — масляная бронзавая лямпа (Рым, 1 ст. н.э.); 4 — свяцільнік з гнуткай свечкай; 5 — люстра-падсвечнік (панікадзіла, 15 ст.); 6 — масляная лямпа з асобным рэзервуарам; 7 — газная лямпа (пач. 19 ст.); 8 — газавы ражок; 9 — ацэтыленавая лямпа; 10 — газанапальны ліхтар вулічнага асвятлення (канец 19 ст.).

каў — дугавую лямпу; у 1850—1910-я г. створаны газасветныя трубкі, у СССР у 1928 — газасветныя, у 1935 — натрыевыя, у 1938 — *люмінесцэнтныя лямпы*, пазней інш. *газаразрадныя крыніцы святла*. З 1920-х г. набыў пашырэнне тэрмін «С.» ў яго сучасным значэнні (да гэтага часу яго разумелі як асвятленне). Развіццё С. паспрыяла станаўленню электронікі. Навук. даследаванні па С. пачаліся з 17 ст. (працы К.*Гюйгенса*, І.*Ньютана*, П.*Бугера*, М.В.*Ламаносава*, І.Г.*Ламберта*, Т.*Юнга*, В.У.*Пятрова* і інш.). Значны ўклад у развіццё С. зрабілі С.І.*Вавілаў*, М.А.Шатэлен (фотаметрыя, нарміраванне святлотэхн. установак), П.М.Ціхадзееў (светлавыя эталоны і вымярэнні), У.В.Мяшкоў (нарміраванне і праектаванне асвятляльных установак) і інш.

Літ.: Мешков В.В. Основы светотехники. Ч. 1. 2 изд. М., 1979; Тиходеев П.М. Световые измерения в светотехнике (фотометрия). 2 изд. М.; Л., 1962; Мешков В.В., Епанешников М.М. Осветительные установки. М., 1972; Гусев Н.М., Макаревич В.Г. Световая архитектура. М., 1973; Карякин Н.А. Световые приборы. М., 1975; Светотехника и инфракрасная техника. Т. 6. Физика, техника и перспективы развития источников света массового применения. М., 1989; Гуторов М.М. Основы светотехники и источники света. 2 изд. М., 1983; Степанцов В.П. Светотехническое оборудование в сельскохозяйственном производстве. Мн., 1987; Трембач В.В. Световые приборы. 2 изд. Мн., 1990.

В.В.Валяўка, У.М.Сацута.

СВЯТЛАФІ́ЛЬТР, прылада, якая змяняе энергію аптычнага выпрамянення (*святла*), а таксама яго спектральны састаў з мэтай вылучэння асобных участкаў спектра.

Прынцып работы С. грунтуецца на з'явах *паглынання святла* (абсарбцыйныя С.), *інтэрферэнцыі святла* (інтэрферэнцыйныя С.), дысперсіі святла (*дысперсійныя фільтры*), *палярызацыі святла* (палярызацыйныя С.) і інш. Найб. пашыраны абсарбцыйныя С., выраблены з каляровага аптычнага шкла. Адрозніваюцца пастаянствам спектральных характарыстык, устойлівасцю да ўздзеянняў святла і т-ры, высокай аптычнай аднароднасцю. Выкарыстоўваюцца ў каляровай фатаграфіі, пры падводнай кіназдымцы, святлатэхніцы, фотаметрыі, колераметрыі, ультрафіялетавай, інфрачырвонай і люмінесцэнтнай мікраскапіі і інш.

СВЯТЛАФО́Р (ад *святло* + грэч. phoros які нясе), светлавое сігнальнае прыстасаванне для рэгулявання руху на вуліцах, аўтадарогах і чыгунцы.

Адрозніваюць С. каляровыя з сігналамі — зялёным, жоўтым, чырвоным, а таксама сінім, месяцова-белым (на чыгунках); пазіцыйныя — сігналізуюць размяшчэннем аднаколяровых агнёў; камбінаваныя — спалучаюць сігналізацыю колерам і размяшчэннем агнёў. Першае прыстасаванне светлафорнага тыпу ўстаноўлена ў Лондане (1868), трохколяровы эл. С. — у Нью-Йорку (1918), Маскве (1930). З 1933 мелі ручное пераключэнне сігналаў, з 1951 — аўтаматычнае. На чыгунцы С. выкарыстоўваецца з пач. 20 ст. (выцесніў *семафор*).

СВЯТЛАЦЕ́НЬ у жывапісе і графіцы, размяшчэнне розных па яркасці колераў або адценняў аднаго колеру, што дае магчымасць успрымаць адлюстраваны аб'ект аб'ёмным у свят-

лопаветраным асяроддзі; перадача С. — адзін з асн. прынцыпаў рэаліст. мастацтва. Градацыі С. (ад найб. яркасці да глыбокага цяню) залежаць ад характару асвятлення, спецыфікі аб'ёмнай формы прадмета, яго фактуры, стану атмасферы. Для дакладнага ўзнаўлення натуры С. выкарыстоўвалі ўжо ант. жывапісцы. С. і яе тэорыю распрацоўвалі мастакі Адраджэння (А.Мантэнья, Мазачыо, Мікеланджэла, М.Караваджа, асабліва Леанарда да Вінчы), і з таго часу С. шырока выкарыстоўваецца жывапісцамі і графікамі як адзін са сродкаў, што вызначае эмацыянальную выразнасць твора. *М.А.Міронаў.*



Святлафоры: 1 — з вертыкальным, 2 — з гарызантальным размяшчэннем сігналаў; 3 — з дадатковай секцыяй; 4 — рэверсіўны; 5 — пешаходны; 6 — для рэгулявання руху трамваяў.

СВЯТЛІ́ЦА, светлы чысты пакой, прызначаны звычайна для прыёму гасцей. Здаўна вядомы ў Расіі, Польшчы і інш. краінах Еўропы. На Беларусі дакумент. звесткі пра С. вядомы з 16 ст. С. існавалі ў жылых дамах і замках, верхніх ярусах брам, лазнях, корчмах і аўстэрыях. Гэта былі вял. жылыя пакоі з кафлянымі грубкамі і камінамі, часам афармляліся шпалерамі. У сял. жыллі вядомы з 19 ст. *Ю.А.Якімовіч.*

СВЯТЛІ́ЦКІ Рыгор Пятровіч (27.9.1872, Кіеў — 28.6.1948), украінскі жывапісец. Нар. маст. Украіны (1946). Вучыўся ў Кіеўскай рысавальнай школе М.Мурашкі (1889—93), Пецярбургскай АМ (1893—1900). З 1947 праф. Кіеўскага маст. ін-та. Быў блізкі да *перасоўнікаў*. Сярод твораў: «Хата Марусі» (1918), «Пераход багунцаў цераз Дняпро» (1928), «Калгас цвіце» (1935), «П.І.Чайкоўскі на Украіне» (1939), «Аблокі» (1947) і інш.

СВЯТЛІ́ЧНЫ Цімафей Іванавіч (1.5.1917, с. Святлічнае Золачаўскага р-на Харкаўскай вобл., Украіна — 26.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з 1942. Разлік «кацюшы» на чале з сяржантам С. вызначыўся 26.6.1944 каля в. Кажамякі Сенненскага р-на Віцебскай вобл., дзе агнём з установкі, стралк. зброі і гранатамі на працягу 6 гадзін знішчыў 13 аўтамашын з ваен. грузам, 4 гарматы і шмат жывой сілы праціўніка, што прарываўся з *віцебскага «катла»*; загінуў у гэтым баі. На месцы бою помнік.

СВЯТЛО́, электрамагнітнае *выпрамяненне*, якое ўспрымаецца чалавечым вокам, з даўжынямі хваль λ ад ~400 нм (фіялетавае) да ~750 нм (чырвонае). Часта ў паняцце С. ўключаюць таксама эл.-магн. хвалі ультрафіялетавага (λ ~400 гм) і інфрачырвонага (λ > 750 нм) дыяпазонаў. Скорасць распаўсюджвання С. ў вакууме каля 300 тыс. км/с (гл. *Скорасць святла*).

Паводле ўяўленняў *квантавай механікі*, С. мае дваістую (карпускулярна-хвалевую) прыроду, уласцівую мікрааб'ектам. Пры *дыфракцыі святла*, *інтэрферэнцыі святла* і інш. з'явах, звязаных з распаўсюджваннем С., выяўляюцца яго хвалевыя ўласцівасці. Карпускулярнай (фатоннай) прыродай С. тлумачацца *фотаэфект*, фоталюмінесцэнцыя і інш. з'явы, абумоўленыя яго ўзаемадзеяннем з рэчывам. С. аказвае на рэчывы розныя ўздзеянні: мех. (*ціск святла*), хім. (*фотахімічныя рэакцыі*), эл. (напр., фотаэфект), цеплавое і інш. Гл. таксама *Паглынанне святла*, *Пераламленне святла*, *Рассеянне святла*, *Рэфракцыя святла* і інш.

Літ.: Гл. да арт. *Оптыка.*

СВЯТЛОАДЧУВА́ЛЬНАСЦЬ фатаграфічная, здольнасць фотаматэрыялу рэагаваць на аптычнае выпрамяненне (*святло*); колькасная мера такой здольнасці. Выражаецца ва ўмоўных адзінках і служыць для правільнага вызначэння *экспазіцыі* пры фотаздымцы і друку. Вызначаецца па пэўнай шчыльнасці фотаслоя, атрыманай пры зададзеных умовах экспанавання фотаматэрыялу і яго хім.-фатагр. апрацоўкі. У розных краінах існуюць розныя метады вызначэння сістэм С. фотаматэрыялаў.

СВЯТЛОАДЧУВА́ЛЬНЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ ў фота- і кінатэхніцы, матэрыялы для здымкі і друкавання *відарысаў аптычных*. Маюць адчувальныя да святла слаі, нанесеныя на празрыстую ці непразрыстую падложку. У якасці святлоадчувальных рэчываў (гл. *Святлоадчувальнасць*) выкарыстоўваюцца галоідныя солі серабра (браміды, хларыды, ёдыды).

Падзяляюцца на чорна-белыя і каляровыя (гл. *Колерафатаграфічныя матэрыялы*), негатыўныя (для фота- і кіназдымкі), пазітыўныя (для атрымання пазітыўных відарысаў з *негатываў*) і абарачальныя (у выніку спец. апрацоўкі даюць пазітыўны відарыс — слайд). У залежнасці ад віду падложкі, на якую нанесена фатаграфічная эмульсія, адрозніваюць фотаплёнкі (падложка — шкло), *плёнкі* і *паперу фатаграфічную*. Гл. таксама *Фатаграфічныя матэрыялы.*

СВЯТЛОДАЛЬНАМЕ́Р, прылада для вымярэння адлегласці з дапамогай светлавых сігналаў, прамадуляваных па фазе, частаце ці працягласці. Мае крыніцу святла (звычайна *лазер*), мадулятар святла, перадавальную і прыёмную сістэмы. Найб. пашыраны імпульсныя і фазавыя С.

Імпульсныя С. выпрамяняюць кароткія імпульсы; адлегласць вызначаецца па часе праходжання светлавога сігналу да аб'екта і назад. Выкарыстоўваюцца ў касм. далёкаметры і навігацыі. У фазавых С., якія працуюць на лазерах бесперапыннага дзеяння, адлегласці вызначаюцца па рознасці фаз выпраменена і прынятага (адбітага) светлавых сігналаў. Выкарыстоўваюцца пераважна ў геадэзіі і спорце.

СВЯТЛОКАПІ́РАВАННЕ, спосаб хуткага капіравання графічных і тэкставых арыгіналаў (чарцяжоў, карт, праектнай дакументацыі і інш.) на святлоадчувальнай паперы. Пры С. святло праходзіць праз празрыстыя месцы арыгінала (напр., калькі), уздзейнічае на святлоадчувальны слой паперы і афарбоўвае яго ў той ці іншы колер. У залежнасці ад спосабу С. атрымліваюць копіі прамыя і люстраныя, пазітыўныя і негатыўныя, чорна-белыя і каляровыя. Пры выкарыстанні дыазапаперы (у яе склад уваходзяць дыазазлучэнні, што разбураюцца пад дзеяннем святла) спосаб наз. *дыязакапіраваннем*. З 1970-х г. выцеснены *электрафатаграфіяй*, у прыватнасці *ксераграфіяй*.

СВЯТЛОКУЛЬТУ́РА раслін, вырошчванне раслін пры штучным асвятленні. Выкарыстоўваецца ў цяплічных

Р.Святліцкі. Хата Марусі. 1918.

гаспадарках для атрымання ранняй расады, зімовага вырошчвання агародніны, у аранжарэях для зімовай выганкі дэкар. раслін, у *фітатронах* з навук. мэтамі. У якасці крыніцы святла выкарыстоўваюць лямпы дастатковай магутнасці, выпраменьванне якіх сканцэнтравана ў фізіял. ч. спектра (даўж. хвалі 400—710 мкм), пры невял. колькасці інфрачырв. і адсутнасці шкодных для раслін кароткахвалевых ультрафіялетавых прамянёў. Найб. эфектыўныя аранжава-чырв. прамяні (выклікаюць інтэнсіўны фотасінтэз), таму крыніцы святла, багатыя імі, выкарыстоўваюцца для паскарэння цвіцення, атрымання ранняга ўраджаю насення і пладоў. Сінефіялетавыя прамяні затрымліваюць развіццё раслін, іх выкарыстоўваюць пры неабходнасці затрымаць цвіценне або атрымаць ураджай лісця (напр., у салаты) ці караняплодаў (напр., у радысу).

СВЯТЛОЛЯЧЭ́ННЕ, фотатэрапія, дазіраванае ўздзеянне на арганізм чалавека інфрачырв. або ультрафіялетавым выпрамяненнем; метад *фізіятэрапіі*. Штучныя крыніцы святла: лямпы інфрачырв. выпрамянення, солюкс, мясц. электрасветлавыя ванны, ртутна-кварцавыя апрамяняльнікі і інш. С. паляпшае крыва- і лімфацёк, паскарае рассысанне запаленчых працэсаў, абязбольвае, сушыць (пры апёках, экзэмах), мае бактэрыцыднае дзеянне, павышае супраціўляльнасць арганізма да прастудных хвароб; ужываецца для прафілактыкі рахіту, як агульнаўмацавальны сродак.

СВЯТЛОСТАБІЛІЗА́ТАРЫ, тое, што *фотастабілізатары*.

СВЯТЛО́Ў Міхаіл Аркадзевіч (17.6.1903, г. Днепрапятроўск, Украіна — 28.9.1964), рускі паэт і драматург. Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1927—28). Друкаваўся з 1917. Першая кн. вершаў — «Рэйкі» (1923). Вершы 1920—30-х г. адзначаны рамант. успрыняццем падзей грамадз. вайны. У Вял. Айч. вайну ваен. карэспандэнт, удзельнічаў у баях за вызваленне Беларусі. Пасляваен. паэт. творам (у т.л. зб. «Вершы апошніх гадоў», 1966, Ленінская прэмія 1967) уласцівы ўзнёсла-рамант. і філас. інтанацыі. Аўтар п'ес, некат. з іх паст. на Беларусі. Неаднойчы бываў на Беларусі, быў знаёмы з Я.Купалам, сябраваў з П.Броўкам, П.Глебкам, П.Панчанкам. На рус. мову пераклаў вершы Я.Купалы, Панчанкі. Яго вершы на бел. мову перакладалі А.Звонак, М.Калачынскі, У.Паўлаў, Я.Семяжон, М.Танк і інш.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—3. М., 1974—75; Бел. пер. — у кн.: Руская савецкая паэзія. Мн., 1953; [Вершы] // Полымя. 1967. № 7.

Літ.: Светов Ф.Г. Михаил Светлов: Очерк творчества. М., 1967; Паперный З.С. Человек, похожий на самого себя. М., 1967; «Ты помнишь, товарищ...»: Воспоминания о Михаиле Светлове. М., 1973; Стральцоў М.Л. І жыццём і песняй // Стральцоў М.Л. У полі зроку. Мн., 1976.

М.В.Няхай.

СВЯТО́ГА ІЛЬІ́ ГО́РЫ (Saint Elias Mountains), горны вузел у сістэме Кардыльер у Паўн. Амерыцы, на мяжы Аляскі (ЗША) і Канады. Даўж. 350 км. Найб. высокія вяршыні — г. Логан (6050 м) і Св. Ільі (5488 м). Складзены пераважна з гранітаў і асадкавых парод. Вышэй за 500 м — снежнікі, фірнавыя палі, буйныя ледавікі. На ніжніх схілах — хвойныя лясы.

СВЯТО́ГА ЛАЎРЭ́НЦІЯ ВО́СТРАЎ (Saint Lawrence Island), на Пн Берынгава м., на ПдУ ад Чукоцкага п-ва. Тэр. ЗША (штат Аляска). Пл. каля 5 тыс. км^2. Паверхня нізінная, з ізаляванымі вулканічнымі ўзвышшамі. Выш. да 673 м (г. Кукулігіт). Тундра. Марскі (зверабойны) промысел. Нас. пункты — Гамбел, Савунга. Адкрыты дацкім і рус. мараплаўцам В.І.*Берынгам* у 1728.

СВЯТО́ГА ЛАЎРЭ́НЦІЯ ЗАЛІ́Ў (Gulf of Saint Lawrence), паўзамкнёнае мора Атлантычнага ак. каля ўсх. берагоў Канады. Адмежаваны ад акіяна а-вамі Ньюфаўндленд і Кейп-Брэтан. Пл. 249 тыс. км^2. Глыб. да 538 м. Упадае р. Св. Лаўрэнція. Клімат мусонны. Сярэдняя т-ра вады зімой ніжэй за -1 °С, летам да 15 °С. Салёнасць на ПнУ да 32 °/₀₀, на З 12—15 °/₀₀. Прылівы паўсутачныя (да 2 м). Са снеж. па май укрыты лёдам. Трапляюцца айсбергі. Суднаходства. Рыбалоўства. Парты: Сет-Іль, Квебек.

СВЯТО́ГА ЛАЎРЭ́НЦІЯ РАКА́ (Saint Lawrence River). У Канадзе, часткова (ад воз. Антарыо да г. Корнуал) служыць мяжой паміж Канадай і ЗША; ажыццяўляе сцёк усёй сістэмы *Вялікіх азёр*, разам з імі з'яўляецца найважнейшым водным шляхам, які злучае ўнутр. ч. ЗША і Канады з Атл. акіянам (гл. *«Святога Лаўрэнція» сістэма водных шляхоў*). Даўж. ўласна ракі (выцякае з воз. *Антарыо* і ўпадае ў зал. Св. Лаўрэнція) каля 1200 км, даўж. ўсёй воднай сістэмы (ад вытокаў р. Сен-Луі, якая ўпадае ў воз. Верхняе) 3350 км. Пл. бас. 1290 тыс. км^2. Ніжэй г. Квебек рака ўтварае эстуарый даўж. каля 400 км, шыр. да 50 км. Асн. прытокі: Атава (злева), Рышэльё (справа). Ледастаў ад снеж. да красавіка. Азёрамі і плацінамі сцёк ракі зарэгуляваны. Сярэдні расход вады 7,8 тыс. м^3/с. Марскія прылівы да г. Труа-Рыўер, каля г. Квебек выш. да 5,5 м. Рака Рышэльё злучае С.Л.р. з р. Гудзон. На ўчастку паміж воз. Антарыо і г. Манрэаль каскад гідравузлоў з вадасховішчамі, найб. ГЭС Мозес (выкарыстоўваецца ЗША і Канадай). На рацэ найб. гарады і парты: Кінгстан, Корнуал, Манрэаль, Сарэль, Труа-Рыўер, Квебек (Канада).

«СВЯТО́ГА ЛАЎРЭ́НЦІЯ» СІСТЭ́МА ВО́ДНЫХ ШЛЯХО́Ў, найбуйнейшы водны шлях у Паўн. Амерыцы. Агульная даўж. 3,77 тыс. км. Уключае Вялікія азёры (Мічыган, Гурон, Эры, Антарыо), ніжняе цячэнне р. Св. Лаўрэнція (320 км, у Канадзе), злучальныя каналы ў ЗША даўж. 345 км (Давенпарт — Чыкага, 185 км; Ніягара — Сірак'юс, 160 км) і Канадзе (Уэленд, воз. Эры — Антарыо, 45 км). Пабудаваны ў 1959, рэканструяваны ў 1970—72. Буйнейшыя парты: Манрэаль, Квебек, Таронта (Канада), Дэтройт, Чыкага (ЗША). Акіянскія суднаідуць без перавалкі праз Манрэаль, Таронта ў Атлантычны ак. Сістэма звязана таксама з р. Місісіпі.

СВЯТО́Е ВО́ЗЕРА, другая назва воз. *Каранёва*.

СВЯТО́Е ВО́ЗЕРА. У Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл., у бас. р. Дняпро, за 5 км на Пн ад г. Рэчыца. Пл. 0,43 км^2.

СВЯТО́Е ВО́ЗЕРА. У Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл., у бас. р. Дабрыца, за 6 км на З ад г. Рагачоў. Пл. 0,29 км^2, даўж. і шыр. 620 м, даўж. берагавой лініі 1,85 км. Катлавіна круглай формы сярод раўніннай разаранай тэрыторыі. Схілы невыразныя. Дно сапрапелістае.

СВЯТО́Е ВО́ЗЕРА. У Касцюковіцкім р-не Магілёўскай вобл., у бас. р. Беседзь, за 24 км на ПдЗ ад г. Касцюковічы. Пл. 0,26 км^2, даўж. 630 м, найб. шыр. 570 м, найб. глыб. 6 м, даўж. берагавой лініі каля 2,1 км. Пл. вадазбору 5,25 км^2. Схілы катлавіны выш. да 3 м, спадзістыя, пад лесам, на Пд выш. да 10 м, разараныя. У паўд. ч. возера заліў. Больш за 40% пл. дна выслана сапрапелем.

СВЯТО́Е ВО́ЗЕРА. У Слаўгарадскім р-не Магілёўскай вобл., на левабярэжнай пойме р. Сож, за 10 км на Пд ад г. Слаўгарад. Пл. 0,25 км^2, даўж. 2 км, найб. шыр. 170 м, даўж. берагавой лініі 4,82 км. Катлавіна старычнага тыпу. Схілы на У выш. 3 м, пад лугам, на З невыразныя. Упадае адзін ручай.

СВЯТО́Е ВО́ЗЕРА. У Шклоўскім р-не Магілёўскай вобл., у бас. р. Арцюслаўка (цячэ праз возера), за 22 км на ПдУ ад г. Шклоў. Пл. 0,23 км^2, даўж. 650 м, найб. шыр. 370 м, даўж. берагавой лініі 1,6 км.

СВЯТО́Й АЛЕ́НЫ ВО́СТРАЎ (Saint Helena Island), уладанне Вялікабрытаніі ў паўд. ч. Атлантычнага ак. Уключае аднайм. востраў (пл. 122 км^2, нас. 7,2 тыс. чал., 1999), в-аў Узнясення (пл. 88 км^2, нас. 1,1 тыс. чал., 1993), а-вы Трыстан-да-Кунья (пл. 201 км^2, нас. 0,3 тыс. чал., 1993). Агульная пл. 411 км^2. Нас. каля 9 тыс. чал. (2000). Адм. ц. і порт — г. Джэймстаўн на в-ве Св. Алены. Афіц. мова англійская. Астравы вулканічныя, складзеныя з базальтаў, трахітаў, рыялітаў. Найвыш. пік Мэры на в-ве Трыстан з групы а-воў Трыстан-да-Кунья (2060 м). Клімат трапічны, пасатны, гарачы на в-ве Узнясення, цёплы на в-ве Св. Алены, марскі ўмераны на а-вах Трыстан-да-Кунья. На в-ве Св. Алены т-ра студз. каля 23 °С, ліп.

каля 20 °С, выпадае за год каля 1000 мм ападкаў. У расл. покрыве ўсіх астравоў пераважаюць травы і хмызнякі. Пад лесам каля 2 тыс. га (толькі на в-ве Св. Алены). Насельніцтва — нашчадкі англічан, афрыканцаў, выхадцаў з краін Азіі. Большасць вернікаў англікане і баптысты. Аснова эканомікі — рыбалоўства, промысел крэветак і лангустаў, сельская гаспадарка, выраб сувеніраў. Валавы ўнутр. прадукт на 1 чал. — 2000 дол. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 2,5 тыс. га зямлі пераважна на в-ве Св. Алены. Гал. экспартная культура — новазеландскі лён (ідзе на выраб высокаякасных канатаў, шпагату), займае каля 1,5 тыс. га. Вырошчваюць таксама бульбу, кукурузу, агародніну. Садоўніцтва. Жывёлагадоўля і птушкагадоўля. Ёсць прамысл. прадпрыемствы па апрацоўцы лёну, вытв-сці канатаў, вырабу мэблі, вышывак і карункаў, харчовыя (у т.л. рыбаперапрацоўчыя), невял. электрастанцыі (6 млн. кВт·гадз, 1996) і інш. Транспарт аўтамаб. і марскі. А-вы Св. Алены і Узнясення — базы бункероўкі суднаў, прамежкавыя пункты міжкантынент. кабеляў. Турызм (в-аў Св. Алены). Астравы экспартуюць рыбу і рыбапрадукты, канаты, рамесніцкія вырабы, імпартуюць прамысл. тавары і харч. прадукты. Атрымліваюць эканам. дапамогу ад Вялікабрытаніі. Грашовая адзінка — фунт в-ва Св. Алены.

Адкрыты партугальцамі ў 1502. У 1653 захоплены галандцамі. З 1673 пад уладай брыт. Ост-Індскай кампаніі. У 1815—21 месца ссылкі і смерці *Напалеона I.* З 1834 калонія Вялікабрытаніі. Пасля адкрыцця Суэцкага канала (1869) заняпаў. У 1-ю і 2-ю сусв. войны брыт. марская база. У 1967 на в-ве створаны заканад. і выканаўчы саветы, якія выбіраюцца мясц. жыхарамі. У 1988 прынята канстытуцыя. *І.Я.Афнагель* (прырода, гаспадарка).

СВЯ́ТЦА, возера ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Друйка, на паўн. ускраіне г. Браслаў. Пл. 0,29 км², даўж. 740 м, найб. шыр. 590 м, найб. глыб. 4,1 м, даўж. берагавой лініі каля 2,1 км. Пл. вадазбору 4,1 км². Катлавіна падпруднага тыпу. Схілы на Пн нізкія, пад забудовамі, часткова разараныя, месцамі змяняюцца балотамі, на Пд выш. да 15 м (камавыя ўзгоркі). Пойма шыр. 5—70 м. Берагі пераважна нізкія, забалочаныя. Дно сапрапелістае, прыбярэжная ч. (акрамя З) пясчаная. Зарастае слаба. Выцякае ручай у воз. Бярэжа.

СВЯ́ТЦЫ, 1) праваслаўная царкоўная кніга, якая складаецца з месяцаслова (календара), пасхаліі (табліцы для штогадовага вызначэння часу пасхі) і некат. малітваў і песнапенняў. 2) Спіс правасл. святых і дзён іх ушанавання, складзены ў каляндарным парадку.

СВЯ́ТЫ І СВЯТО́ЧНЫЯ ДНІ, замацаваныя звычаямі і абрадамі дні, якія выражаюць пэўныя погляды, адносіны людзей да прыроды і паміж сабою. Многія склаліся ў старажытнасці. У працэсе гіст. развіцця зменьваліся, некат. адміралі, узнікалі новыя. На ранняй стадыі чалавечага грамадства, калі асн. заняткамі людзей было паляўніцтва, рыбалоўства і збіральніцтва, важнае значэнне надавалася святам, што наладжваліся ў гонар *татэма*, якому пакланяўся род і лічыў сваім апекуном. Татэмныя святы адбываліся ў спец. месцах, дзе захоўваліся родавыя святыні, суправаджаліся песнямі і танцамі, расказамі міфаў пра ўзнікненне роду. Святы ў гонар татэма ў некат. месцах захоўваліся і пасля таго, як род знік. Больш трывалымі і разнастайнымі былі земляробчыя святы. На Беларусі яны з'явіліся пераважна ў бронзавым і жалезным вяках, пастаянна развіваліся і сталі характэрнай рысаю культуры бел. этнасу, яго календара. Першым веснавым святам было *гуканне вясны*. Яго гал. элемент — спяванне *веснавых песень*, якімі заклікалі хутчэйшы прыход вясны, ваджэнне карагодаў, гушканне на арэлях. Абрадавай ежаю свята было печыва, якое нагадвала птушак. Гал. веснавым святам у земляробаў было валачобнае, якое пазней атрымала назву *Вялікдзень*. У старажытнасці яно было пачаткам новага каляндарнага года, таму ў час свята выказвалі добрыя пажаданні на ўвесь год. Ім адзначалі таксама пачатак веснавых земляробчых работ. Асн. яго элементы — абход валачобным гуртом усіх двароў (хат), спяванне *валачобных песень*, віншаванні. Лічылася, што валачобныя абрады спрыяюць ураджаю, дабрабыту сям'і, засцерагаюць ад хвароб. Продкаў паміналі на *Радаўніцу*. У канцы вясны — пачатку лета, праз сем тыдняў пасля Вялікадня, спраўлялі *Сёмуху* («зялёныя святкі»). Хаты ўпрыгожвалі галінкамі дрэў, двары высцілалі аерам. У гэты час у некат. рэгіёнах Беларусі спраўлялі абрад кумавання, або куставы (гл. *Куст*). Абавязковай абрадавай стравай у час кумавання была яечня. Гал. летнім святам беларусаў было *Купалле*. Яно звязана з летнім сонцастаяннем і накіравана пераважна на тое, каб садзейнічаць паспяванню ўраджаю. Для яго характэрны ўяўленні, што агонь (вогнішча — сімвал сонца), вада, расліннасць спрыяюць ураджаю, здароўю людзей. З купальскім святам звязаны шматлікія абрады, багатая купальская міфалогія бел. этнасу, у якой адлюстраваны яго паэтычны погляд на прыроду і мары пра шчаслівае жыццё. Купальская міфалогія ўвасоблена ў *купальскіх песнях*, карагодах, паданнях і займае важнае месца ў нац. культуры беларусаў. Цэнтральнае восеньскае свята — *Багач*. Яго спраўлялі пасля ўборкі збожжавых культур, напярэдадні сяўбы азімых. Сімвал свята — сявенька з жытам і васковай свечкай, якую называлі багачом. З гэтым сімвалам абыходзілі ўсе двары, пасля яго ставілі ў хаце пэўнага гаспадара і пакідалі да наступнага жніва. З культам продкаў звязаны восеньскія *Дзяды*. У сярэдневякоўі ў сувязі са зменамі ў календары і пераносам пачатку новага года з вясны на зіму сфарміравалася зімовае свята *Каляды*. Асн. яго абрад — *калядаванне*. Яго ўдзельнікі хадзілі па хатах, выконвалі віншавальныя *калядныя песні* з пажаданнем добрага ўраджаю, дабрабыту, атрымлівалі за гэта дарункі. Істотны элемент гэтага свята — абрадавая вячэра (*куцця*). У час свята наладжвалі шматлікія гульні, танцы, забавы (*«Жаніцьба Цярэшкі»*, *«Яшчур»* і інш.), варажбу. З пашырэннем хрысціянства на Беларусі ўсталяваліся і хрысц. святы. Іх спраўляюць паводле царк. календара (правасл. і каталіцкага). Многія земляробчыя каляндарныя святы прымеркаваны да хрысціянскіх (гл. *Святы рэлігійныя*). Перапляліся даты правядзення хрысц. і земляробчых каляндарных свят і іх абрады. Сінкрэтычны характар у побыце набыла і міфалогія. Са з'яўленнем у сярэдневякоўі на Беларусі яўрэяў і татараў у іх асяроддзі спраўляюць іудаісцкія і мусульманскія святы. Шмат новых свят з'явілася на Беларусі ў 20 ст. Сярод іх дзярж.: Дзень Канстытуцыі (15 сак.), Дзень Перамогі (9 мая), Дзень Дзярж. герба Рэспублікі Беларусь і Дзярж. сцяга Рэспублікі Беларусь (2-я нядзеля мая), Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі — 3 ліп.), Дзень Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі — 7 ліст. Адзначаюць таксама Дзень абаронцаў Айчыны і Узбр. Сіл Рэспублікі Беларусь (23 лют.), Дзень жанчын (8 сак.), Свята працы (1 мая). З'явілася многа свят, прысвечаных работнікам асобных прафесій, галін прамысловасці і сфер дзейнасці: Дзень работнікаў сац. абароны (5 студз.), Дзень бел. навукі (апошняя нядзеля студз.), Дзень міліцыі (4 сак.), Дзень работнікаў радыё, тэлебачання і сувязі (7 мая), Дзень хіміка (апошняя нядзеля мая), Дзень мед. работніка (3-я нядзеля чэрв.), Дзень будаўніка (2-я нядзеля жн.), Дзень настаўніка (1-я нядзеля

кастр.), Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысл. комплексу (3-я нядзеля ліст.) і інш. Апрача гэтых свят, на Беларусі пачалі адзначаць Дзень сям'і (15 мая), Дзень моладзі (апошняя нядзеля чэрв.), Дзень бел. пісьменства (1-я нядзеля вер.), Дзень маці (14 кастр.), Дзень памяці (2 ліст.), Дзень правоў чалавека (10 снеж.) і інш. Нерабочымі святочнымі днямі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца: 1 студз. — Новы год; 7 студз. — Каляды правасл.; 8 сак. — Дзень жанчын; 1 мая — Свята працы; 9 мая — Дзень Перамогі; 3 ліп. — Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі); 7 ліст. — Дзень Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі; 25 снеж. — Каляды каталіцкія. *М.Ф.Піліпенка.*

СВЯТЫ́ КА́МЕНЬ СЯНЕ́ЖЫЦКІ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1997). Размешчаны на могілках в. Сянежычы Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. Ружавата-шэры дробназярністы граніт з двума ксеналітамі цёмна-шэрага гнейсу (18 × 7 і 28 × 15 см), якія ўтвараюць паглыбленні да 6 см. Даўж. 1,65 м, шыр. 1,43 м, выш. 0,5 м, у абводзе 4,7 м, аб'ём 0,6 м^3, маса каля 1,7 т. Мае прасападобную форму. Прынесены ледавіком каля 220—150 тыс. гадоў назад са Скандынавіі. У дахрысціянскія часы валун меў культавае значэнне, захаваліся легенды. *В.Ф.Вінакураў.*

СВЯТЫ́ НОС, назва некалькіх мысаў на ўзбярэжжы Паўн. Ледавітага ак.: на паўд. беразе м. Лапцевых, пры ўваходзе ў прал. Дзмітрыя Лапцева, Саха (Якуція); на Ціманскім беразе Баранцава м. (Архангельская вобл. Расіі); на Кольскім п-ве, на беразе Баранцава м., паміж Церскім і Мурманскім берагамі (Мурманская вобл. Расіі).

СВЯ́ТЫ РЭЛІГІ́ЙНЫЯ, знамянальныя дні, якія адзначаюцца ў памяць аб важных царк. падзеях і ў гонар святых. Хрысціянскія святы падзяляюцца на 12 галоўных (або двунадзесятых) і 5 вялікіх. З ліку гал. свят некаторыя адзначаюцца ў пастаянныя дні і наз. непераходнымі (усяго іх 9 — Раство Хрыстова, Хрышчэнне Гасподняе, Стрэчанне Гасподняе, Дабравешчанне Прасвятой Багародзіцы, Праабражэнне Гасподняе, Успенне Прасвятой Багародзіцы, Раство Прасвятой Багародзіцы, Узвіжанне Крыжа Гасподняга, Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы), а другія залежаць ад зменлівага часу святкавання Вялікадня і наз. пераходнымі (іх 3 — Уваход Гасподні ў Іерусалім, Ушэсце Гасподняе, Дзень Святой Тройцы). 5 вял. свят (Абразанне Гасподняе, Раство Іаана Прадцечы, Памяць святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла, Адсячэнне галавы Іаана Прадцечы, Пакроў Прасвятой Багародзіцы) з'яўляюцца непераходнымі.

С.р. суправаджаюцца адпаведнымі богаслужэннямі і абрадамі: яны звязаны з рэліг. веравучэннем, культам. У час многіх царк. свят забараняецца працаваць, вучыцца, забаўляцца. Рэліг. святочныя дні прызначаюцца для духоўнага богаўгоднага жыцця, наведвання царквы, малітваў. Царк. правасл. каляндар дакладна вызначае пасты (посныя дні). За год бываюць 4 шматдзённыя пасты (найб. важны і строгі — Вялікі Пост, які працягваецца 7 тыдняў перад Вялікаднем). Найвялікшае хрысціянскае свята — *Вялікдзень* (Пасха, Уваскрэсенне Хрыстова). Пасля прыняцця хрысціянства на Беларусі многія царк. святы паступова былі прымеркаваны да стараж. нар. свят, таму нар. і рэліг. святы нярэдка адзначаюцца ў адны і тыя ж дні, напр., Каляды — Раство Хрыстова; Грамніцы — Стрэчанне Гасподняе; Гуканне вясны — Дабравешчанне; Вербніца — Уваход Гасподні ў Іерусалім; Вялікдзень — Уваскрэсенне Хрыстова (Пасха); Сёмуха (Зялёныя святкі) — Тройца; Купалле — Раство Іаана Прадцечы; Спас — Праабражэнне Гасподняе, Багач — Раство Дзевы Марыі (Раство Багародзіцы) і інш. С.р. ў правасл. і каталіцкіх хрысціян адзначаюцца па розных календарах (католікі — па грыгарыянскім, а правасл. — па юліянскім), таму розніца паміж датамі іх правядзення складае 13 дзён. Многія бел. святы маюць сінкрэтычны (змешаны) характар, бо ў іх у рознай ступені прысутнічаюць язычніцкія і хрысц. элементы (Стрэчанне, Юр'е, Спас, Пакровы).

Прыхільнікі ісламу і іудаізму адзначаюць свае рэліг. святы па мясцовым календары. Гал. мусульманскія святы: Курбан-Байрам (дзень ахвярапрынашэння Богу), Ураза-Байрам (дзень заканчэння посту — уразы), Маўлюд (дзень нараджэння прарока Мухамеда), Мірадж (ноч цудоўнага ўзнясення прарока Мухамеда на неба). Важную ролю ў жыцці мусульман адыгрывае вялікі пост на працягу месяца рамадан (рамазан). Найб. буйныя іудзейскія святы: Песах (Пасха, свята зыходу яўрэяў з Егіпта), Сукот (свята збору ўраджаю і ўспаміну пра 40-гадовае вандраванне яўрэйскага народа па егіпецкай пустыні), Рош-Гашана (першыя дні Новага года), Шавуот (дзень уручэння Усявышнім прароку Майсею Торы і дзесяці запаведзей), Йом-Кіпур (апошні з 10 дзён пакаяння; дзень збавення). Гл. таксама *Святы і святочныя дні.*

Літ.: Ліцьвінка В. Святы і абрады беларусаў. 2 выд. Мн., 1998; Лозка А. Беларускі народны каляндар. Мн., 1993; Сысоў У.М. З крыніц спрадвечных. Мн., 1997; Религиозные традиции мира: Пер. с англ. [Т.] 1—2. М., 1996. *Э.С.Дубянецкі.*

СВЯТЫ́Я БЕЛАРУ́СІ, рэальныя гістарычныя асобы, якія, паводле паданняў, за сваю адданасць рэлігіі надзелены здольнасцю рабіць цуды, за што пасля смерці былі ўшанаваны царквой. У 1984 усталявана святкаванне Сабора беларускіх святых у 1-ю нядзелю пасля св. Тройцы (*Сёмухі*). У Сабор увайшлі 15 святых. Міна Полацкі (?—1116), епіскап полацкі. У час яго епіскапства прыняла пострыг Ефрасіння Полацкая. Ушаноўваецца правасл. царквой як адзін з першых архіпастыраў, які спрыяў распаўсюджванню хрысціянства на Беларусі. Дзень памяці 3 ліпеня; Марцін Тураўскі (? — 1150), манах. Вядомы са «Сказання пра Барыса і Глеба» (канец 11 — пач. 12 ст.). Жыў адзін у пустыні. Калі захварэў, у келлю з'явіліся св. пакутнікі Барыс і Глеб і дапамаглі яму. Блажэннага пакутніка Тураўскага сталі шанаваць адразу пасля смерці. Дзень памяці 10 ліпеня; Расціслаў Мсціславіч (1100-я г. — 1167), князь смаленскі і кіеўскі. Заснаваў у Смаленску самастойную епіскапію. Дзень памяці 27 сакавіка; *Ефрасіння Полацкая* (каля 1101 — 1167); Дыянісій Полацкі (? — 1182), епіскап полацкі, манах Кіева-Пячэрскай лаўры. Лічыцца, што з яго блаславлення на св. зямлю адправілася Ефрасіння Полацкая, ён быў ініцыятарам яе кананізацыі. Дзень памяці ў 3-ю нядзелю пасля Пяцідзесятніцы; *Кірыла Тураўскі* (каля 1130 — каля 1182); Лаўрэнцій Тураўскі (каля 1113 — пасля 1190), манах. У 1182—94 узначальваў тураўскую кафедру. Праславіўся глыбокай верай і адданасцю царкве, сваёй здольнасцю вылечваць людзей. Дзень памяці 11 лютага; Елісей Лаўрышаўскі (?—1250), сын вял. князя ВКЛ Траняты, займаў высокую пасаду пры двары вял. князя ВКЛ Міндоўга. Потым пайшоў у пустэльню і разам з правасл. манахам заснаваў каля Новагародка лаўру. Мошчы яго тварылі цуды. Дзень памяці 5 лістапада; Сімяон Полацкі (1220—89), епіскап полацкі. Паходзіў з полацкіх князёў. Раздаў шмат угоддзяў цэрквам і манастырам; быў дабрадзейны да жабракоў, сірот, няшчасных і пакрыўджаных. Дзень памяці 6 лютага; *Віленскія пакутнікі* Іаан, Антоній і Яўстафій (?—1347). Дні памяці 27 красавіка і 26 ліпеня; Юльянія Альшанская (?—1550), дачка правасл. магната Рыгора Альшанскага. Культ Юльяніі Альшанскай адыграў значную ролю ва ўмацаванні рэліг. свядомасці правасл. жыхароў Беларусі. Дні памяці 6 ліпеня і 11 кастрычніка; Соф'я Слуцкая (1585—1612), апошняя княгіня з роду слуцкіх князёў Алелькавічаў, нашчадкаў вял. князя ВКЛ Альгерда. Дзякуючы дзейнасці княгіні Слуцк яшчэ пры яе жыцці меў асаблівае значэнне ў рэліг. жыцці Беларусі, быў цвярдыняй праваслаўя. Дзень памяці 1 красавіка; *Афанасій Брэсцкі* (каля 1595—15.9.1648); Макарый Канеўскі (1606—78), ігумен пінскі, загінуў пакутніцкай смерцю, абараняючы праваслаўе. Дні памяці 26 мая і 20 верасня; Гаўрыіл Белastоцкі (1684—90), дзіця; паводле падання, быў выкрадзены мясц. арандатарам, тайна вывезены ў Беластok і закатаваны. Заступнік хворых і гаротных дзяцей. Дзень памяці 3 мая; Георгій *Каніскі* (1717—95); Праведны Іаан Кармянскі (1893—1917), іераманах, вызначаўся дабрынёй, міласэрнасцю і празорлівасцю. Мошчы знаходзяцца ў Пакроўскай царкве ў в. Карма Добрушскага р-на. Дні памяці 31 мая і 9 верасня.

У Сабор не ўвайшлі асобы, пра якіх не захавалася дастаткова звестак або якія жылі на землях, што не ўваходзяць у тэр. сучаснай Беларусі. Але без іх немагчыма ўявіць сабе гісторыю бел. цар-

квы: св. пакутнік Макарый, мітрапаліт кіеўскі; Меркурый, воін смаленскі; прападобныя Аўрамій і Яфрэм смаленскія; свяшчэль Кіпрыян, мітрапаліт кіеўскі, літоўскі, маскоўскі і ўсяе Русі і інш. Нараджэннем або служэннем сваім апасродкавана з Беларуссю звязаны роўнаапостальскі Мікалай Японскі, свяшчэль Ціхан, патрыярх маскоўскі, дабраверны князь Цімафей-Даўмонт і інш. 28.10.1999 на пасяджэнні Сінода Бел. правасл. царквы здзейснена кананізацыя «ў ліку мясцоваўшаноўваемых святых 23 новапакутнікаў», клірыкаў Мінскай епархіі 1-й пал. 20 ст. Дзень памяці 28 кастрычніка.

З каталіцкіх святых на Беларусі ўшаноўваюць Казіміра (5.10.1458—4.3.1484), сына караля Польшчы і вял. кн. ВКЛ Казіміра IV Ягелончыка, патрона Вільні і Гродзенскай рымска-каталіцкай епархіі, апекуна зямель ВКЛ. Дзень памяці 4 сакавіка; *Андрэя Баболю* (30.11.1591—16.5.1657); Ю.А.*Каліноўскага* (1.9.1835—15.11.1907); М.М.*Кольбе* (8.1.1894—14.8.1941). Да уніяцкіх святых прылічаны Іасафат *Кунцэвіч* (1580—12.11.1623).

Літ: Мельников А.А. Путь непечален: Ист. свидетельства о святости Белой Руси. Мн., 1992; Акафист святому мученику младенцу Гавриилу Заблудовскому. Белосток, 1993; Святыя зямлі Беларускай // Беларускі праваслаўны каляндар, 1994. Мн., 1993; Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. давед. Мн., 2001.

А.А.Мельнікаў.

СВЯТЫ́Я МЕ́СЦЫ, месцы, звязаныя з падзеямі свяшчэннай гісторыі, наведваннямі багоў і святых, цудатворствамі; важны элемент культу ўсіх рэлігій (гл. *Культ рэлігійны*). У хрысціян асаблівай пашанай карыстаюцца святыні ў Палесціне, дзе жыў, прапаведаваў, прыняў пакутніцкую смерць і ўваскрэс Ісус Хрыстос. Да С.м. часам адносяць храмы і манастыры, дзе захоўваюцца *мошчы* святых, цудатворныя абразы і інш. святыні, а таксама цудатворныя крыніцы, месцы, дзе адбываліся з'яўленні абразоў і інш. цудатворствы. У каталіцызме адрозніваюць свяшчэнныя (асабліва адметныя ў культавай практыцы месцы, асвячоныя вышэйшымі царк. ірархамі, а таксама касцёлы, *алтары* і могілкі) і С.м. (вобласці Палесціны, звязаныя са старазапаветнымі падзеямі і жыццём Ісуса Хрыста, Дзевы Марыі). Паводле кананічнага права, свяшчэнныя месцы павінны быць унесены ў літургічныя кнігі і традыцыйна выключаны са свецкай юрысдыкцыі.

СВЯЦІ́ЛАВІЦКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1926—27 і ў 1935—56. Утвораны 8.12.1926 у Гомельскай акрузе. Цэнтр — в. *Свяцілавічы*. Падзяляўся на 39 сельсаветаў. 4.8.1927 скасаваны, сельсаветы перададзены Веткаўскаму і Чачэрскаму р-нам. 12.2.1935 адноўлены, уключаў 17 сельсаветаў. З 20.2.1938 у Гомельскай вобл. 17.12.1956 С.р. скасаваны, тэр. раёна зноў перададзена ў Веткаўскі і Чачэрскі р-ны.

СВЯЦІ́ЛАВІЧЫ, вёска ў Веткаўскім р-не Гомельскай вобл., на правым беразе р. Беседзь, на аўтадарозе Чачэрск—Ветка. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 30 км на ПнУ ад г. Ветка, 52 км ад Гомеля. 1125 ж., 445 двароў (2001). Лясніцтва, прадпрыемства электрасетак, філіялы раённай сельгасхіміі, Веткаўскага дарожнарамонтнага буд. ўпраўлення, Веткаўскага водаканала. Сярэдняя школа, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, аптэка, аддз. сувязі. Брацкія магілы чырв. партызан, расстраляных герм. акупантамі ў жн. 1918, сав. воінаў і партызана. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. У вёсцы гарадзішча *зарубінецкай культуры*.

Вядомы з 1565, калі вял. кн. Жыгімонт II Аўгуст даў пустое сяльцо С. («люди того сельца сего лета все в поветрие вымерли») Чачэрскага староства чачэрскаму баярыну Ілью Іванавічу. У 17 ст. належалі Шалютам, Язерскім, у 18 ст. — Вяроўкіным-Шалютам. З 1772 у складзе Рас. імперыі. У канцы 19 ст. ў Рагачоўскім пав. Магілёўскай губ.; у 1886 — 365 ж., 64 двары, царква, бальніца, 3 крамы. У 1926—27 і 1935—56 С. — цэнтр *Свяцілавіцкага раёна*.

СВЯЦІ́ЛІШЧЫ, капішчы, кумірніцы, трэбішчы, храмы ідальскія, дахрысціянскія культавыя збудаванні, месцы маленняў і ахвярапрынашэнняў усх. славян і суседніх народаў. Былі С. родавыя, племянныя і для некалькіх суседніх плямён. Найчасцей прысвячаліся *Перуну*, на іх устанаўлівалі ідалаў. Размяшчаліся на ўзвышшах, астравах і мысах сярод балот, на берагах азёр і рэк, зрэдку насыпаліся штучна. Месцам С. былі таксама камяні-следавікі, культавыя ўзгоркі і крыніцы; ушаноўваліся свяшчэнныя дрэвы (асабліва дуб як дрэва Перуна) і гаі. На Беларусі найб. канцэнтрацыя С. нагадваецца ў паласе гал. Еўрап. водападзелу. Пасля прыняцця хрысціянства многія С. былі прыстасаваны для патрэб царквы і набылі функцыі *прошчаў*, у сувязі з чым частка іх у рэліктавай форме захавалася да 20 ст.

Свяцільня: 1, 2 — настольныя лямпы; 3,4 — таршэры; 5, 6, 7 — люстры; 8 — садовыя ліхтары.

Літ.: Рыбаков Б.А. Язычество Древней Руси. М., 1987; Яго ж. Язычество древних славян. М., 1981; Седов В.В. Восточные славяне в VI—XIII вв. М., 1982.

СВЯЦІ́ЛЬНАСЦЬ, аптычная характарыстыка паверхневай інтэнсіўнасці *светлавога патоку*, які выпрамяняецца дадзеным пунктам паверхні цела. Роўная адносінам светлавога патоку, што выходзіць з элемента паверхні, да плошчы гэтага элемента. Адзінка вымярэння С. ў СІ — люмен з квадратнага метра (лм/м^2).

СВЯЦІ́ЛЬНАСЦЬ ЗО́РКІ, магутнасць выпрамянення зоркі. Роўная поўнай энергіі, якая выпрамяняецца зоркай за адзінку часу. Вымяраецца звычайна ў адзінках свяцільнасці Сонца, а таксама ў абс. *зорных велічынях*.

Поўная свяцільнасць Сонца $3{,}86 \cdot 10^{26}$ Вт, свяцільнасць зорак 10^{33}—10^{20} Вт. Поўная С.з. з нулявой зорнай велічынёй — $2{,}72 \cdot 10^{28}$ Вт. Акрамя поўнай адрозніваюць С.з. ў пэўным спектральным інтэрвале, напр., візуальная С.з. (святлоаддача ў бачнай частцы спектра), фатаграфічная (у інтэрвале 0,33—0,49 мкм) і інш.

СВЯЦІ́ЛЬНЫ ГАЗ, сумесь гаручых газаў (метану, аксіду вугляроду, вадароду і інш.). Прадукт тэрмічнай перапрацоўкі каменных вугляў ці *піролізу* цяжкіх фракцый нафты. У пач. 20 ст. выкарыстоўваўся для асвятлення вуліц і памяшканняў.

СВЯЦІ́ЛЬНЯ, асвятляльная прылада блізкага дзеяння. Складаецца з крыніцы святла (звычайна *лямпа напальвання*) і асвятляльнай арматуры (гл. *Асвятляльныя прылады, Святлатэхніка*).

Бываюць падвесныя, столевыя (у т.л. люстры), насценныя (бра), настольныя, ручныя, пераносныя (таршэры) і інш.; спец. С. робяцца герметычныя, пыла-, вода-, газанепранікальныя, выбуханебяспечныя. Паводле прызначэння адрозніваюць С. для асвятлення закрытых памяшканняў (прамысл., жыллёвых, грамадскіх), трансп. сродкаў (рухомых саставаў чыг. і аўтамаб. транспарту, паветранага, марскога і рачнога флоту), адкрытых пляцовак (трансп., прамысл., грамадскага, ваеннага і спец. прызначэння).

На Беларусі С. вырабляюцца на *Брэсцкім электралямпавым заводзе, Лідскім заводзе электравырабаў* і інш.

СВЯЦІ́ЦА, вёска ў Ляхавіцкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 45 км на ПдЗ ад горада і 41 км ад чыг. ст. Ляхавічы, 220 км ад Брэста. 1025 ж., 399 двароў (2001). Сярэдняя школа, Палац культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік партызанам.

СВЯЦІ́ЦКІ ВАЛУ́Н, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1991). Размешчаны за 500 м на ПдЗ ад в. Свяціца Полацкага р-на Віцебскай вобл., каля шашы Лепель—Полацк. Чырвона-буры граніт рапаківі з крышталямі палявога шпату. Даўж. 3,95 м, шыр. 2,3 м, выш. 1,55 м, у абводзе 9,9 м, аб'ём 7,5 м^3, маса бачнай часткі каля 20 т. Мае прасадпадобную форму. Прынесены ледавіком каля 20—18 тыс. г. назад з Карэльскага перашыйка. *В.Ф.Вінакураў.*

СВЯ́ЦКІ ПАЛА́ЦАВА-ПА́РКАВЫ АНСА́МБЛЬ, помнік архітэктуры і садова-паркавага мастацтва 2-й пал. 18 — пач. 19 ст. ў в. Свяцк Гродзенскага р-на. Размешчаны ў б. маёнтку Валовічаў (у пач. 20 ст. належаў Ю.Гурскаму). Пабудаваны паводле праекта італьян. арх. Дж. Сака для гродзенскага маршалка Ю.Валовіча і яго сына Антонія. Уключаў палац, капліцу, гасп. пабудовы, парк. Фарміраваўся ў 2 этапы: у 1779 — буд-ва і афармленне інтэр'ера палаца ў раннекласіцыстычным стылі, у пач. 19 ст. — дапаўненне агульнай кампазіцыі бакавымі флігелямі з галерэямі-каланадамі. Рэканструяваны ў 1930-я г. (арх. А.Сасноўскі). Цэнтр. корпус палаца — 2-павярховы мураваны будынак з цокальным паверхам, накрыты высокім ламаным мансардавым дахам. Гал. фасад расчлянёны 3 рызалітамі (цэнтральны — 4-калонны з трохвугольным, бакавыя — з лучковымі франтонамі). Дваровы фасад з 5-гранным эркерам, дэкарыраваны пілястрамі і завершаны



Свяцкі палацава-паркавы ансамбль. Схема планіроўкі.

гранёным шатровым дахам. У дэкоры будынка выкарыстаны дробныя пілястры, парталы ўваходаў, вузкія рызаліты.

Інтэр'еры аздоблены размалёўкамі (маст. Т.Манькоўскі, Ф.Смуглевіч; не захаваліся), мелася зала ў пампейскім стылі. Элементы інтэр'ера (панэлі, каміны, люстры, вазоны, мэбля і інш.) былі зроблены па эскізах і пад кіраўніцтвам Сака. Флігелі пастаўлены перпендыкулярна да асн. корпуса, накрыты вальмавымі дахамі, аздоблены руставанымі лапаткамі; адзін выкарыстоўваўся пад жыллё, у другім — манеж. З асн. корпусам злучаны паўцыркульнымі галерэямі ў выглядзе аркад. Насупраць палаца ў 19 ст. ў рэтраспектыўна-гатычным стылі пабудавана капліца. Парк пейзажнага тыпу (пл. 12 га) закладзены ў канцы 18 — пач. 19 ст. Размешчаны на 2 пагорках, у лагчыне — сістэма вадаёмаў на розных узроўнях, за імі лясны масіў. У 1985 парк адноўлены паводле спец. праекта.

В.Р.Анціпаў, А.М.Кулагін.

СВЯ́ЦКІ ПА́ТАЧНЫ ЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1887—1914 у маёнтку Свяцк Аўгустоўскага пав. (цяпер вёска ў Гродзенскім р-не). Выпрацоўваў вінаградны цукар, бульбяную патаку, глюкозу. Меў паравую машыну і паравы кацёл; у 1913 працавала 55 рабочых.

СВЯЧА́, вёска ў Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл., на р. Свячанка, на аўтадарозе Лепель—Віцебск. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на З ад г.п. Бешанковічы, 63 км ад Віцебска, 32 км ад чыг. ст. Чашнікі. 326 ж., 139 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік архітэктуры — Свята-Раства-Багародзіцкая царква (1895).

СВЯЧА́, вадасховішча ў Нараўлянскім р-не Гомельскай вобл., каля в. Мальцы. Створана ў пойме р. Гразіва ў 1981. Пл. 0,8 км^2, даўж. 1,1 км, найб. шыр. 1 км, найб. глыб. 3 м, аб'ём вады 1,77 млн. м^3. Даўж. агараджальнай дамбы 3,6 км. Наліўное: напаўняецца вадой з р. Гразіва па водападводным канале. Ваганні

Свяцкі палацава-паркавы ансамбль.

ўзроўню вады на працягу года 1 м. Выкарыстоўваецца для ўвільгатнення с.-г. угоддзяў, рыбагадоўлі і адпачынку.

СВЯЧА́НКА, Свяча, рака ў Сенненскім, Чашніцкім і Бешанковіцкім р-нах Віцебскай вобл., правы прыток р. *Ула* (бас. р. Зах. Дзвіна). Даўж. 84 км. Пл. вадазбору 551 км². Выцякае з воз. Вял. Святое (Сенненскі раён) за 1,6 км на У ад в. Замошша, вусце за 1,8 км на З ад в. Броды Бешанковіцкага р-на. Прытокі: р. Свінка (злева), невялікія ручаі і меліярацыйныя каналы. Цячэ праз азёры Хотлінскае, Маеўскае, Сцержань (да ўпадзення ў гэтае возера рака наз. Свяча), Слабадское; ручаямі злучана з воз. Рыбакоўскае. Даліна амаль на ўсім працягу трапецападобная, каля вытоку і воз. Сцержань V-падобная; пераважная шыр. 200—400 м, каля азёр, праз якія цячэ С., пашыраецца да 1—1,5 км. Пойма двухбаковая, чаргуецца па берагах, шыр. 100—300 м, каля в. Вярхоўе і Броды Бешанковіцкага р-на адсутнічае; на вял. працягу забалочаная і парэзаная меліярац. каналамі. Рэчышча ад вытоку на працягу 10,6 км каналізаванае. Пераважная шыр. рэчышча 5—10 м, у ніжнім цячэнні да 15 м.

СВЯЧЭ́ННЕ АРГАНІ́ЗМАЎ, тое, што *біялюмінесцэнцыя*.

СВЯЧЭ́ННЕ МО́РА, біялюмінесцэнцыя, свячэнне паверхневага слоя акіяна (мора) «халодным» святлом пры механічным уздзеянні на ваду (рух вады ў месцах сыходжання цячэнняў, пры хваляванні, ад ходу судна і інш.). Святло прадуцыруецца некат. дробнымі марскімі арганізмамі (розныя рачкі і інш.) і параўнальна буйнымі жывёламі (медузы, грэбнікі і інш.). Назіраецца паўсюдна ў акіянах і морах, акрамя раёнаў з моцна апрэсненымі водамі.

СВЯЧЭ́ННЕ НАЧНО́ГА НЕ́БА, сумарны эфект сукупнасці светлавых з'яў, якія назіраюцца на фоне начнога неба і вызначаюць яго яркасць у ясную бязмесячную ноч. Складаецца з уласнага свячэння верхняй атмасферы, эпізадычна — святла *палярнага ззяння*, а таксама сумарнага выпрамянення зорак, міжзорнага газу, *задыякальнага святла, процізззяння*.

СВЯШЧЭ́ННАЕ ПАДА́ННЕ, сукупнасць рэлігійных палажэнняў, якія дапаўняюць і каменціруюць *Свяшчэннае пісанне*. У хрысціянстве побач з *Бібліяй* лічыцца крыніцай божага адкрыцця, якое вусна перадавалася *апосталамі*. Да С.п. адносяць *сімвал веры*, творы *айцоў царквы*, «Правілы апостальскія», вырашэнні Усяленскіх і некат. памесных сабораў. У каталіцызме С.п. дапоўнена шэрагам папскіх дэкрэталій. У пратэстантызме абвяргаецца боская прырода С.п. У ісламе С.п. з'яўляецца *Суна*, у іудаізме — *Талмуд*.

СВЯШЧЭ́ННАЕ ПІСА́ННЕ, кнігі, якія змяшчаюць вызначальныя ідэі пэўнай *рэлігіі* і ўспрымаюцца вернікамі як дадзеныя шляхам божага адкрыцця. Кожная рэлігія мае ўласнае С.п.: напр., у хрысціянстве С.п. лічыцца *Біблія* (Стары і Новы запаветы), у іудаізме — Стары запавет, у будызме — Трыпітака, у ісламе — *Каран*, у індуізме — *Веды*.

«СВЯШЧЭ́ННАЯ ДРУЖЫ́НА», добраахвотная ахова», тайная арг-цыя, створаная прыдворнай арыстакратыяй у Расіі ў 1881 для барацьбы з рэв. рухам. Засн. пасля замаху нарадавольцаў на цара Аляксандра II (гл. таксама *І.Я.Грынявіцкі*). Гал. яе кіраўнікі П.П.Шувалаў, І.І.Варанцоў-Дашкаў і інш.; у склад уваходзілі вял. князі, міністры, генералы. Арг-цыя мела разгалінаваную агентуру ў Расіі і за мяжой, двайную канспірацыю. Удзельнікі «С.д.» грамілі падп. друкарні, наладжвалі паліт. вышук; з правакацыйнымі мэтамі выдавалі ў Жэневе газ. «Вольное слово» і «Правда». У канцы 1882 дзейнасць «С.д.» спынена.

«СВЯШЧЭ́ННАЯ ЛІ́ГА» 1684—98, саюз Аўстрыі, Рэчы Паспалітай, Венецыі, некаторых германскіх княстваў, пры актыўным удзеле рым. курыі, накіраваны супраць Турцыі. У 1686 да «С.л.» далучылася Расія, якая перад тым заключыла *«Вечны мір» 1686* з Рэччу Паспалітай супраць Турцыі і Крыма. Выконваючы саюзніцкія абавязацельствы, Расія здзейсніла паходы сваёй арміі ў 1687 і 1689 супраць Крымскага ханства і ў 1695 і 1696 на Азоў, чым адцягнула значную частку тур. сіл з інш. напрамкаў дзеянняў супраць войск лігі. Аднак саюзнікі, баючыся ўзмацнення Расіі на ўзбярэжжы Чорнага м. і выхаду яе ў паўд. моры, не былі зацікаўлены ў моцы «С.л.». Таму яна, насуперак пажаданням Расіі, канчаткова распалася ў ходзе *Карлавіцкага кангрэса 1698—99*.

«СВЯШЧЭ́ННАЯ РЫ́МСКАЯ ІМПЕ́РЫЯ», «Свяшчэнная Рымская імперыя германскай нацыі», сярэдневяковае дзярж. аб'яднанне, у склад якога ўваходзілі Германія (займала пануючае становішча), шэраг каралеўстваў, герцагстваў і зямель (Чэхія, Паўн. і Сярэдняя Італія з Рымам, Бургундыя, Нідэрланды, Швейцарыя, польскія землі і інш.). Гэтыя тэр. ў розны час і ў рознай ступені падпарадкоўваліся герм. імператару. Засн. ў 962 герм. каралём *Атонам I*. Вяла агрэсіўную палітыку, гал. чынам на У (землі *палабскіх славян*) і Пд (Італія), куды герм. каралі рэгулярна рабілі паходы для атрымання імператарскай кароны з рук рым. папаў і з мэтай падпарадкавання Італіі (фактычна кожны раз яе трэба было заваёўваць нанава). Барацьба імператараў з рым. папамі ў 11—13 ст. (за *інвеставуру* і інш.) аслабіла ўладу імператара над Італіяй і ўзмацніла асобныя герм. княствы. У сярэдзіне 13 ст. «С.Р.і.» страціла Італію, а Германія распалася на шэраг княстваў. Найб. моцныя князі — *курфюрсты* выбіралі імператара. Гэты парадак быў юрыдычна замацаваны *Залатой булай* Карла IV 1356. У 15 ст. фактычнай самастойнасці дамаглася Чэхія, аддаліўся Швейцарскі саюз; у 16 ст. да Іспаніі адышлі Нідэрланды. Паступова ўлада імператара стала намінальнай (не мела ні фін. сродкаў, ні арміі), а саслоўна-прадстаўнічая ўстанова — *рэйхстаг* быў паслухмяны герм. князям. З развіццём феад. адносін асобныя герм. княствы ўзмацніліся. Пасля *Трыццацігадовай вайны 1618—48* у выніку *Вестфальскага міру 1648* за герм. княствамі прызнана паліт. самастойнасць, што канчаткова ліквідавала імператарскую ўладу на тэр. Германіі. У час напалеонаўскіх войнаў з большасці ням. княстваў утвораны т. зв. *Рэйнскі саюз 1806—13* пад пратэктаратам Напалеона I. Апошні імператар «С.Р.і.» Франц II Габсбург у 1806 адрокся ад рымска-герм. кароны, і імперыя перастала існаваць. Правячыя дынастыі «С.Р.і.»: *Саксонская дынастыя* (962—1024), *Франконская дынастыя* (1024—1125), *Гогенштаўфены* (1138—1254), *Габсбургі* (1273—1806 з перапынкамі), *Люксембургі* (1308—1437 з перапынкамі).

Літ.: Неусыхин А.И. Очерки по истории Германии в средние века // Неусыхин А.И. Проблемы европейского феодализма. М., 1974; Колесницкий Н.Ф. «Священная Римская империя» в освещении современной западногерманской историографии // Средние века. М., 1959. Вып. 14; Шиндлинг А., Циглер В. Кайзеры: Пер. с нем. Ростов н/Д, 1997.

СВЯШЧЭ́ННЫ САЮ́З, саюз еўрапейскіх манархаў, заключаны пасля краху напалеонаўскай імперыі. 26.9.1815 у Парыжы рас. імператарам Аляксандрам I, аўстр. імператарам Францам I і прус. каралём Фрыдрыхам Вільгельмам III падпісаны т.зв. Акт свяшчэннага саюза. 19.11.1815 да С.с. далучыўся франц. кароль Людовік XVIII, потым большасць манархаў Еўропы. Вялікабрытанія не ўвайшла ў саюз, але падтрымлівала яго палітыку. Дзейнасць С.с. была накіравана на ажыццяўленне рашэнняў *Венскага кангрэса 1814—15*, задушэнне рэв. і нац.-вызв. руху ў Еўропе. Вядучая роля ў саюзе належала Аляксандру I і К.В.*Метэрніху*. На 1-м Ахенскім кангрэсе 1818 вырашаны пытанні пра датэрміновы вывад акупац. войск з Францыі, пра захаванне ў Еўропе дзярж. граніц, вызначаных Венскім кангрэсам, і абсалютысцкіх рэжымаў. На Тропаўскім кангрэсе 1820 Расія, Аўстрыя і Прусія падпісалі пратакол, якім абвяшчалася права ўзбр. ўмяшання ў справы інш. дзяржаў (у адпаведнасці з гэтым рашэннем Аўстрыя задушыла Неапалітанскую рэвалюцыю 1820—21 і рэвалюцыю 1821 ў П'емонце). Лайбахскі кангрэс 1821 санкцыяніраваў аўстр. інтэрвенцыю ў Неапалі і П'емонце. У адпаведнасці з рашэннем Веронскага кангрэса 1822 франц. армія ў 1823 уварвалася ў Іспанію, задушыла рэвалюцыю і аднавіла абсалютызм. Супярэчнасці паміж С.с. і

Вялікабрытаніяй узніклі з-за розных адносін да вайны за незалежнасць ісп. калоній у Амерыцы 1810—26, паміж Расіяй і Аўстрыяй — у сувязі з процілеглымі адносінамі да грэч. нац.-вызв. паўстання 1821—29. Паўстанне дзекабрыстаў у 1825 у Расіі, рэвалюцыя 1830 у Францыі і Бельгіі, *паўстанне 1830—31* у Польшчы, Літве і Беларусі моцна падарвалі С.с. У пач. 1830-х г. саюз фактычна распаўся (фармальна ў 1848 у час *рэвалюцыі 1848 у Францыі*).

СГРАФІ́ТА, графіта (італьян. sgraffito, graffito літар. — выдрапаны), тэхнічны спосаб манум.-дэкар. жывапісу, засн. на выдрапванні верхняга слоя тынкоўкі да ніжніх кантрастных па колеры слаёў. Вызначаецца трываласцю і ўстойлівасцю да атм. змен. Выкарыстоўваецца пераважна для аздаблення фасадаў і інтэр'ераў будынкаў. Вядома з эпохі Адраджэння ў Італіі, пазней у Чэхіі, Польшчы і інш. еўрап. краінах. На Беларусі рэшткі С. захаваліся на сценах Гродзенскага Старога замка (16 ст., цяпер затынкаваны) і фрызе Гродзенскага касцёла кляштара брыгітак (сярэдзіна 17 ст., рэстаўрыраваны ў 1978). Цікавасць да С. ў пэўнай ступені адрадзілася ў творах стылю класіцызму (фрагменты сграфітавага дэкору ў палацы *Ружанскага палацавага комплексу*). З 2-й пал. 20 ст. выкарыстоўвалася ў манум. мастацтве: дэкар. кампазіцыі ў фае кінатэатра «Кіеў» у Мінску (маст. Г.Гаркуноў, А.Кішчанка), у кінатэатры «Беларусь» у Брэсце (маст. І.Крупскі) і інш. У тэхніцы С. працавалі бел. мастакі Г.Вашчанка, С.Дамарад, Г.Жарын, А.Жгун, Л.Каленік, Кішчанка, У.Крываблоцкі, З.Літвінава, С.Рабашчук, С.Сакалоў, У.Стальмашонак, В.Чайка.

Э.І.Вецер.

Сграфіта на фасадзе дома «Каля хвіліны» ў Старым горадзе Прагі.

СГС СІСТЭ́МА АДЗІ́НАК, сістэма адзінак фіз. велічынь з асн. адзінкамі: даўжыні — *сантыметр*, масы — *грам*, часу — *секунда*. Абрэвіятура СГС утворана ад першых літар найменняў асн. адзінак.

Прынята 1-м Кангрэсам электрыкаў (Парыж, 1881) у якасці *сістэмы адзінак* для механікі і электрадынамікі. Для эл.-магн. велічынь былі прыняты 2 сістэмы: эл. статычная СГСЭ (*электрычная пастаянная* $E_0 = 1$, *магнітная пастаянная* $\mu_0 = 1/c^2$, c — скорасць святла ў вакууме) і эл.-магн. СГСМ ($\mu_0 = 1$, $E_0 = 1/c^2$), заснаваныя на *Кулона законе* для ўзаемадзеяння эл. зарадаў і магн. полюсаў. У 2-й пал. 20 ст. найб. пашырэнне атрымала сіметрычная (змешаная) СГСЭ с.а., у якой магн. адзінкі роўныя адзінкам СГСМ, а эл. — адзінкам СГС ($E_0 = 1$, $\mu_0 = 1$). Пасля шырокага ўкаранення *Міжнароднай сістэмы адзінак* (СІ) СГС с.а. выкарыстоўваецца толькі ў тэарэт. фізіцы і астраноміі.

Літ.: Сена Л.А. Единицы физических величин и их размерности. 3 изд. М., 1988; Деньгуб В.М., Смирнов В.Г. Единицы величин: Словарь-справ. М., 1990. *А.І.Болсун.*

СД (ням. SD скарачэнне ад Sicherheitsdienst des Reichsführers SS служба бяспекі рэйхсфюрэра *СС*), служба бяспекі і паліт. разведкі (шпіянажу) унутры СС, якая дзейнічала ў межах *Нацыянал-сацыялісцкай партыі* (НСДАП) у час дыктатуры гэтай партыі ў Германіі. Засн. ў 1931 Г.*Гімлерам* як служба разведкі (узначальваў Р.*Гайдрых*), з вер. 1932 наз. СД. Напачатку служыла для збору інфармацыі пра паліт. праціўнікаў і апазіцыянераў унутры НСДАП. З 1933 парт. ведамства з уласнай арг-цыяй на ўсёй тэр. дзяржавы па ажыццяўленні паліт. кантролю над насельніцтвам, з 1934 адзіная разведвальная служба нацысцкай партыі. У 1939 разам з паліцыяй бяспекі падпарадкавана Гал. ўпраўленню імперскай бяспекі (РСХА). Дзейнічала праз штатных і няштатных агентаў, мела архівы (картатэкі), афіц. канторы; выканаўчую ўладу ажыццяўляла *гестапа*. З СД рэкрутаваліся кіруючыя кадры для паліцыі бяспекі, якія дзейнічалі ў 2-ю сусв. вайну (са студз. 1943 СД узначальваў Э.Кальтэнбрунер) як кіраўнікі т. зв. айнзацгруп у акупіраваных краінах, у т.л. на Беларусі (айнзацгрупы «А» і «В»). Яны арганізоўвалі забойствы паліт. праціўнікаў фашызму, яўрэяў і інш. У падпарадкаванні Мінскага СД знаходзіўся *Трасцянецкі лагер смерці*. У лют. 1944 да СД перайшлі гал. функцыі органа ваен. разведкі і контрразведкі *Абвера*. На *Нюрнбергскім працэсе* пасля 2-й сусв. вайны СД прызнана злачыннай арг-цыяй.

СДР (англ. SDR, special drawing rights), спецыяльныя правы запазычання, якія з'яўляюцца інструментам *Міжнароднага валютнага фонду* і дазваляюць ствараць валютныя рэзервы на аснове міжнар. пагаднення з мэтай папярэджання небяспекі пастаяннай нястачы валютных рэзерваў. Рашэнне аб размеркаванні і вяртанні СДР прымаюцца саветам кіраўнікоў па прапанове дырэктара-распарадчыка. Кошт СДР вызначаецца на аснове вартасці кошыка з вызначаных фондам валют краін-удзельніц.

СЕА́НС (франц. séance), 1) публічная дэманстрацыя чаго-н. ва ўстаноўлены прамежак часу без перапынку (напр., С. у кіно, С. паказу мадэлей). 2) Выкананне якога-н. дзеяння, работы, лячэння ў вызначаны час, а таксама прамежак часу, калі гэта адбываецца (напр., С. гіпнозу).

«СЕА́Т» (SEAT, скар. ад Sociedad Española de Automoviles de Turismo), сям'я

Фрагмент сграфіта на фрызе касцёла кляштара брыгітак у Гродне.



Да арт. **Сграфіта**. Г.Гаркуноў, А.Кішчанка. Фрагмент дэкаратыўнай кампазіцыі ў фае кінатэатра «Кіеў» у Мінску. 1968.

легкавых аўтамабіляў аднайм. ісп. фірмы. Аўтамабілі асабліва малога і малога класаў выпускаюцца ў асн. па ліцэнзіі італьян. канцэрна «ФІАТ» з 1950. Кузаў 2- ці 4-дзверны седан або хэтчбэк. Усе мадэлі пярэднепрывадныя і з пярэднім размяшчэннем рухавіка. Магутнасць рухавіка ад 29 да 110 кВт, найб. скорасць да 218 км/гадз.

Легкавы аўтамабіль «СЕАТ»: мадэль «Ібіза» з кузавам хэтчбэк.

СЕА́ТО, гл. *Арганізацыя дагавору Паўднёва-Усходняй Азіі.*

СЕБАРЭ́Я (ад лац. sebum сала + грэч. rheō цяку), хвароба скуры, пры якой парушаецца дзейнасць тлушчавых залоз (зменьваецца хім. састаў і колькасць скурнага тлушчу). Асн. формы С.: тлустая і сухая. Пры тлустай скура порыстая, грубая, жаўтавата-бруднага колеру, валасы зліпаюцца, бліскаць, пры сухой С. скура лушчыцца; бывае таксама змешаная форма. Лакалізуецца на валасістай ч. галавы, твары, у міжлапатачнай вобласці. Ускладненні: вугры, выпадзенне валасоў. Лячэнне тэрапеўтычнае.

М.З.Ягоўдзік.

СЕБАСЦЬЯ́Н (Sebastian; сапр. Ш э - б е ш ц ь е н; Sebestyen) Георг (Дзьёрдзь; 17.8.1903, Будапешт — 1989), венгерскі дырыжор. Скончыў Вышэйшую школу музыкі імя Ф.Ліста (1921). Вучань Б.*Вальтэра*. З 1922 працаваў у оперных т-рах Германіі. У 1931—37 дырыжор сімф. аркестра Усесаюзнага радыё ў Маскве, дзе ажыццявіў канцэртныя пастаноўкі опер В.А.Моцарта і оперы «Фідэліо» Л.Бетховена, выступаў у сімф. канцэртах (першы выканаў 1-ю сімфонію Ц.Хрэннікава і 1-ю сюіту «Рамэо і Джульеты» С. Пракоф'ева). З 1938 у ЗША, з 1946 у Парыжы. Працаваў дырыжорам у «Апера камік», паставіў шэраг рус. опер у Парыжскай оперы, у т.л. «Яўген Анегін» і «Пікавая дама» П.Чайкоўскага. Шмат гастраліраваў, у т.л. ў СССР у 1961.

Літ.: Григорьев Л.Г., Платек Я.М. Современные дирижеры. М., 1969.

СЕБАСЦЬЯ́НА ДЭЛЬ П'ЁМБА [Sebastiano del Piombo; сапр. Л у ч а н і (Luciani); каля 1485, г. Венецыя, Італія — 21.6.1547], італьянскі жывапісец эпохі *Адраджэння*. Вучыўся ў Дж.Беліні. Раннім творам, створаным пад уплывам Джарджоне і Тыцыяна, уласцівы прасветлена-лірычны лад (створкі аргана з выявамі 4 святых для царквы Сан-Барталамеа аль Рыяльта, карціна для гал. алтара царквы Сан-Джавані Крызастома ў Венецыі). З 1511 працаваў у Рыме, дзе зблізіўся з Рафаэлем; работы адметныя больш строгім і ўраўнаважаным характарам пры захаванні гучнасці каларыту, уласцівага *венецыянскай школе жывапісу*: фрэскі на віле Фарнезіна (1511), партрэт рымлянкі (т.зв. «Дараторэя», каля 1515) і інш. З 2-й пал. 1510-х г. пад уплывам Мікеланджэла яго творы набылі падкрэслена драм. афарбоўку («Уваскрашэнне Лазара», 1519). Работы, створаныя ў перыяд контррэфармацыі, вызначаюцца змрочнай жорсткасцю вобразнага ладу, які выявіў крызіс маст. прынцыпаў Высокага Адраджэння («Нясенне крыжа», 1537). У 1540-я г. для сабора Санта-Марыя дэла Пачэ ў Рыме выканаў буйную манум. кампазіцыю «Сустрэча Марыі і Елізаветы».

Я.Ф.Шунейка.

СЕ́БЕК (грэч. С у х а с), у старажытнаегіпецкай рэлігіі і міфалогіі бог вады і разліву ракі Ніл. Яго ўяўлялі ў выглядзе чалавека, кракадзіла (свяшчэнная жывёла С.) або чалавека з галавой кракадзіла. Цэнтр культу — г. Кракадзілопаль. Лічылася, што С. дае багацце і ўрадлівасць. У стараж. тэкстах ён разглядаецца як абаронца багоў і людзей, аднак часта выступае як вораг багоў *Ра* і *Асірыса*.

СЕ́БРЫС (Sebris) Карліс (н. 18.2.1914, пас. Сіноле Гулбенскага р-на, Латвія), латышскі акцёр. Нар. арт. Латвіі (1964). Нар. арт. СССР (1974). Скончыў драм. курсы пад кіраўніцтвам Э.Зелтмаціса (1938) і паступіў у трупу Нац. т-ра Латвіі ў Рызе. Стварыў яркія вобразы, адметныя высокім майстэрствам пераўвасаблення: Сацін («На дне» М.Горкага), Парфірый Пятровіч («Злачынства і кара» паводле Ф.Дастаеўскага), сэр Тобі, Фальстаф («Дванаццатая ноч», «Генрых IV» У.Шэкспіра), Філіп II («Дон Карлас» Ф.Шылера), Кала Бруньён («Кала Бруньён» паводле Р.Ралана), Йынь («Йынь з вострава Кіхну — дзікі капітан» Ю.Смуула) і інш. Зняўся ў кінафільмах: «Каўгурскае паўстанне» (1941), «За лебядзінай чарадой аблокаў» (1957), «Чужая ў пасёлку» (1959), «Табага» змяняе курс» (1965), «Эдгар і Крысціна» (1966), «Слугі д'ябла» (1970), «Кароль Лір», «Балада пра Берынга і яго сяброў» (абодва 1971), «Слугі д'ябла на чортавым млыне» (1972), «Напад на тайную паліцыю» (1975), «Дзюма на Каўказе» (1980), «Забытыя рэчы» (1982) і інш.

Себасцьяна дэль П'ёмба. Нясенне крыжа. 1537.

СЕБУ́ (Cebú), востраў у цэнтр. ч. Філіпінскага архіпелага. Пл. 4,4 тыс. км^2 (з прылеглымі астравамі, што ўваходзяць у аднайм. правінцыю, каля 5,1 тыс. км^2), даўж. каля 220 км. Рэльеф пераважна горны, выш. да 1073 м. Складзены ў асн. з дыярыту і крышт. сланцаў, перакрытых пясчанікамі, гліністымі сланцамі, вапнякамі. Уздоўж узбярэжжаў каралавыя рыфы. Клімат субэкватарыяльны. Ападкаў 1500 мм за год. У гарах цэнтр. ч. — вільготныя трапічныя лясы, па перыферыі — лугі. Трапічнае земляробства (вырошчванне кукурузы, цукр. трыснягу, рысу, тытуню, манга). Рыбалоўства. Порт — Себу.

СЕБУ́ (Cebú), горад на Філіпінах, на в-ве Себу. Адм. ц. аднаймен. правінцыі. Вядомы з 16 ст. Каля 700 тыс. ж. (2001). Марскі порт, вузел аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Гандлёва-размеркавальны цэнтр с.-г. раёна. Прам-сць: нафтаперапр., металаапр., цукр., алейная. 5 ун-таў, у т.л. каталіцкі з 1595. Арх. помнікі ісп. калан. архітэктуры 16—17 ст. (форт, цэрквы, жылыя дамы).

СЕ́БХА, аазіс у Сахары на ПдЗ Лівіі. Каля 10 тыс. ж. (2001). Вузел аўтамаб. і караванных дарог. Вырошчваюць фінікавую пальму, пладовыя дрэвы, агародніну. Рамёствы.

СЕВАЗВАРО́Т, навукова абгрунтаванае чаргаванне с.-г. культур у часе і на тэр.; найб. важная ч. *сістэмы земляробства*. Неабходнасць увядзення С. даказалі практыка вырошчвання *монакультуры*, вывучэнне біял. асаблівасцей раслін і іх уплыў на якасці глебы. С. забяспечвае выкарыстанне ўсіх відаў с.-г. угоддзяў, павышэнне *ўрадлівасці глебы* і ўраджайнасці с.-г. культур (збожжавых у 1,5—2 разы, цукр. буракоў у 1,5—2,5 раза, бульбы на 20—50%), расшырэнне асартыменту культур, памяншэнне сезоннасці работ, барацьбу з пустазеллем і хваробамі, ахову глеб ад эрозіі. Перыяд, на працягу якога культуры і *папар* у пэўнай паслядоўнасці праходзяць праз кожнае поле С., наз. яго ратацыяй; пералік груп с.-г. культур і папару ў парадку іх чаргавання — схемай С. Спалучэнне некалькіх С. складае сістэму С. Вылучаюць 3 тыпы С.: палявы (большую ч. пл. займаюць збожжавыя, бульба і тэхн. культуры), кармавы (больш за палову пл. пад кармавымі культурамі) і спец. С. (вырошчваюць культуры, што патрабуюць урадлівых

глеб ці асаблівых умоў, напр., гародніну, тытунь, рыс). На Беларусі найб. эфектыўныя С., у якіх збожжавыя займаюць 50—55% пл., тэхн. 25—33%, бульба і лён 11—12%; ці збожжавыя 55—65%, кармавыя 25—33%, кораніклубняплоды 11—12%.

СЕВА́Н, возера ў Арменіі, адно з найбуйнейшых на Каўказе. Размешчана на Армянскім нагор'і на выш. 1900 м. Пл. 1240 км^2, сярэдняя глыб. 28,5 м, найб. 83 м. Займае цэнтр. ч. міжгорнай упа-

Возера **Севан**.

дзіны, абкружанай горнымі хрыбтамі. Двума мысамі возера падзяляецца на Малы С. і Вялікі С., злучаных пралівам (шыр. да 8 км). У возера ўпадае 28 невял. рэк, выцякае р. Раздан. Былы в-аў Севан з-за спуску часткі вады ў сувязі с з буд-вам на р. Раздан ГЭС злучыўся з сушай. З мэтай павелічэння водных рэсурсаў С. і Севана-Разданскага каскада ГЭС пабудаваны падземны тунэль Арпа—Севан (даўж. 49 км) для перакідвання вод р. Арпа. Замярзае С. толькі ў самыя халодныя зімы. Рыбалоўства. Возера ў складзе аднайм. нац. парку. На беразе С. — г. Севан.

СЕВА́Н, горад у Арменіі, на беразе воз. *Севан*. Каля 30 тыс. ж. (2001). Чыг. станцыя. Вузел аўтадарог. З-ды: эл.-выканаўчых механізмаў, эл.-шклоізаляцыі, тытунёва-ферментацыйны і інш. ГЭС. Горнакліматычны курорт. Філіял Ерэванскага бат. сада.

СЕВА́Н, прыродны нац. парк у Арменіі, на ўзбярэжжы воз. *Севан*. Пл. 150,1 тыс. га. Засн. ў 1978 для аховы і ўзнаўлення прыродных рэсурсаў басейна возера, горна-лясных комплексаў Армянскага нагор'я, помнікаў культуры (арх. комплекс Севанскага манастыра, 4 ст.). Сустракаюцца буйн. капытныя жывёлы, драпежнікі, шмат вадаплаўных птушак, эндэмічна севанская стронга.

СЕВАСТО́ПАЛЬ, горад на Пд Украіны, у Аўтаномнай Рэспубліцы Крым. 366 тыс. ж. (1993). Чыг. станцыя. Порт на Чорным м. База чарнаморскіх флатоў Расіі і Украіны. Суднабудаванне і суднарамонт. З-ды: прыладабуд., «Хімпром» і інш. Прам-сць: харчасмакавая, дрэваапр., лёгкая. Прыладабуд. ін-т, Ін-т біялогіі паўд. мораў (з акварыумам). 2 тэатры. Музеі: Чарнаморскага флоту, абароны і вызвалення горада, маст. і інш. Марская абсерваторыя. Панарама «Абарона Севастопаля 1854—55» (1902—04), дыярама «Штурм Сапун-гары 7 мая 1944 года» (1959). Петрапаўлаўскі сабор (1843—48) і Графская прыстань (1846) у стылі класіцызму. Каля С. скальны Інкерманскі манастыр (9—10 ст.).

У старажытнасці каля С. знаходзіўся антычны г.*Херсанес*. Як база рас. Чарнаморскага флоту і крэпасць засн. ў 1783. Спачатку наз. Ахціяр (белы ўцёс), з 1784 — С. (грэч. — велічны горад). З 1802 уваходзіў у Таўрычаскую губ. У 1804 аб'яўлены гал. ваен. портам Чорнага мора. Праславіўся ў час Крымскай вайны 1853—56 (гл. *Севастопальская абарона 1854—55*). З 1875 злучаны чыгункай з Сімферопалем. У канцы 19 ст. буйны прамысловы цэнтр. У *Рэвалюцыю 1905—07* тут адбылося *Севастопальскае паўстанне 1905*. З 1917 у складзе Таўрычаскай сав. рэспублікі, акупіраваны англ., франц. і грэч. войскамі. У 1920 вызвалены Чырв. Арміяй. З 1921 С. у Крымскай аўтаномнай сав. сацыяліст. рэспублікі РСФСР. У Вял. Айч. вайну адбылася гераічная *Севастопальская абарона 1941—42*. Вызвалены ў выніку *Крымскай аперацыі 1944*. У 1954 перададзены ў склад Крымскай вобл. Украіне (гл. *Крым*).

СЕВАСТО́ПАЛЬСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1905, паўстанне маракоў Чарнаморскага флоту, салдат гарнізона Севастопаля, рабочых порта і Марскога з-да ў перыяд *Рэвалюцыі 1905—07 у Расіі*. Пачалося 11 ліст. ў адказ на спробу камандавання флотам учыніць расправу над удзельнікамі шматтысячнага мітынгу матросаў і салдат. 12 ліст. да паўстанцаў далучыліся каманды крэйсера «Ачакаў», браняносца «Св. Панцеляймон» (б. «Пацёмкін»). Кіраўнік — лейтэнант П.П.*Шміт*; 15 ліст. пад яго камандаваннем было 12 караблёў. Паўстанцы патрабавалі склікання ўстаноўчага сходу, устанаўлення рэспублікі, 8-гадзіннага працоўнага дня, скарачэння тэрміну і паляпшэння ўмоў ваен. службы і інш. Задушана ўрадавымі войскамі, пакарана больш за тысячу ўдзельнікаў, лейтэнант Шміт, матросы А.І.Гладкоў, Н.Г.Антоненка і С.П.Часнік расстраляны.

СЕВАСТО́ПАЛЬСКАЯ АБАРО́НА 1854—55, 349-дзённая (25.9.1854—8.9.1855) абарона Севастопаля рас. войскамі ад узбр. сіл саюзных дзяржаў (Францыя, Вялікабрытанія, Турцыя, Сардзінскае каралеўства) у *Крымскую вайну 1853—56*. Пасля паражэння рас. войск на р. Альма саюзныя войскі падышлі да Севастопаля. Абарону горада ўзначаліў нач. штаба Чарнаморскага флоту віцэ-адм. У.А.*Карнілаў*, яго памочнікі — віцэ-адм. П.С.*Нахімаў* і контр-адм. У.І.Істомін. Пад іх кіраўніцтвам Севастопаль быў абаронены з боку мора, паводле плана інж.-падпалк. Э.І.*Татлебена* на сушы пабудаваны ўмацаванні, якія прыкрывалі подступы да Малахава кургана. Каб праціўнік не прарваўся ў порт, каля ўвахода ў Паўн. бухту былі затоплены 7 старых караблёў, з якіх знялі частку гармат, а з экіпажаў (10 тыс. чал.) сфарміравалі 22 батальёны. Нягледзячы на колькасную перавагу ў войсках і тэхн. сродках, неаднаразовыя штурмы, армія саюзнікаў доўгі час не магла поўнасцю блакіраваць крэпасць і зламаць яе абарончаў. Толькі накіраваўшы гал. сілы супраць ключавой пазіцыі абароны — Малахава кургана, праціўнік 8.9.1855 захапіў яго. Рас. войскі пакінулі Севастопаль; яны страцілі каля 102 тыс. чал., праціўнік — каля 71 тыс. чал. Гераічная С.а. паўплывала на вынік мірных перагавораў. У час С.а. вызначыліся 54-ы Мінскі, 27-ы Віцебскі, 28-ы Полацкі, 51-ы Літоўскі пях. палкі. Мужна змагаліся на абарончых пазіцыях ураджэнцы Мінскай губ. браты Ігнацій і Іосіф Ляскоўскія (выпускнікі Брэсцкага кадэцкага корпуса), ураджэнцы Гродзенскай губ. І.*Сержпутоўскі* і Р.*Траўгут*; загінулі выпускнікі Полацкага кадэцкага корпуса паручнікі А.Пісарэўскі, В.Маркевіч, А.Бушкоўскі, капітан М.Фядотаў і інш. У Севастопалі пастаўлены помнікі Карнілаву, Нахімаву, Татлебену, матросу П.М.Кошку, затопленым караблям Чарнаморскага флоту, створана панарама «Абарона Севастопаля» і інш.

Да арт. **Севастопальская абарона 1854—55**. Фрагмент панарамы «Абарона Севастопаля». Мастак Ф.Рубо. 1902—04.

Літ.: Зайончковский А.М. Оборона Севастополя: Подвиги защитников. 2 изд. СПб., 1904; Тарле Е.В. Героическая Севастопольская оборона 1854—1855. М., 1957; гл. таксама пры арт. *Крымская война 1853—56.*

А.М.Лукашэвіч, В.А.Юшкевіч.

СЕВАСТО́ПАЛЬСКАЯ АБАРО́НА 1941—42, 250-дзённая (з 30.10.1941 да 4.7.1942) абарона горада і галоўнай ваенна-марской базы Чарнаморскага флоту ў Вял. Айч. вайну. У кастр. 1941 войскі 11-й ням. арміі (камандуючы ген.-фельдмаршал Э. фон *Манштэйн*) і рум. корпуса прарваліся ў Крым. Сав. войскі адышлі да Керчанскага п-ва, а частка сіл — да Севастопаля. 4.11.1941 з часцей Севастопальскага гарнізона, караблёў і авіяцыі Чарнаморскага флоту, а таксама часцей Асобнай Прыморскай арміі (ген.-маёр І.Я.*Пятроў*) створаны Севастопальскі абарончы раён (САР) на чале з камандуючым флотам віцэ-адм. П.С. Акцябрскім. Ням.-фаш. камандаванне ажыццявіла 3 буйныя наступленні на горад. Першыя два (11—21 ліст. і 17—31 снеж. 1941) штурмы севастопальцы адбілі і прымусілі ворага перайсці да абароны. Поспеху абарончаў садзейнічалі падмацаванне, перакінутае з Каўказа, і *Керчанска-Феадасійская дэсантная аперацыя 1941—42* сав. войск, што прымусіла праціўніка аслабіць націск на Севастопаль. Перад апошнім штурмам (пачаўся 7.6.1942) у складзе САР налічвалася 106 тыс. чал., 600 гармат і мінамётаў, 38 танкаў, 100 самалётаў, лінейны карабель, крэйсеры, эсмінцы і інш. Ням. камандаванне сканцэнтравала пад Севастопалем амаль усю 11-ю армію (каля 204 тыс. чл., 450 танкаў, больш за 2000 гармат і мінамётаў, 1060 самалётаў). Цаной вял. страт 18 чэрв. ням. і рум. войскі прарваліся да Паўн. бухты, Інкермана, Сапун-гары, а 30 чэрв. ўварваліся ў горад. Невялікія групы абарончаў разрознена адышлі да бухтаў і на мыс Херсанес. 4.7.1942 паводле загаду Стаўкі адбылася эвакуацыя часткі абарончаў, некат. спрабавалі прарвацца ў горы да партызан. У баях за Севастопаль праціўнік страціў каля 300 тыс. чал. забітымі і параненымі. У абароне Севастопаля прымалі ўдзел беларусы і ўраджэнцы Беларусі, у т.л. Героі Сав. Саюза лётчыкі М.В.*Аўдзееў*, Дз.М.*Мінчугоў*, У.А.*Наржымскі*, У.А.*Скугар*, маракі ВМФ Г.М.*Халасцякоў*, І.К.*Хурс*, А.Р.Азаронак, П.Ц.Бандарэнка, С.С.Варкоў, О.С.Жукоўскі, прадстаўнікі сухап. войск Я.В.*Леашэня*, А.Х.Юхімчук, марскія пехацінцы Г.Н.Вішнеўскі, М.А.*Савіцкі*. У гонар гераічнай абароны 22.12.1942 устаноўлены медаль «За абарону Севастопаля» (узнагароджана больш за 45 тыс. чал.). У 1945 Севастопалю нададзена ганаровае найменне «Горад-герой».

Літ.: Героическая оборона Севастополя, 1941—1942. М., 1969; Крылов Н.И. Огненный бастион. М., 1973; Огненные дни Севастополя. 2 изд. Симферополь, 1982; Борисов Б.А. Подвиг Севастополя. 3 изд. Симферополь, 1977; Долготович Б.Д. Твои сыновья, Беларусь. Мн., 2000.

Г.Дз.Бабусенка, В.А.Юшкевіч.

СЕВАСЦЬЯ́НАЎ Віталь Іванавіч (н. 8.7.1935, г. Краснаўральск Свярдлоўскай вобл., Расія), савецкі касманаўт. Двойчы Герой Сав. Саюза (1970, 1975). Лётчык-касманаўт СССР (1970). Канд. тэхн. н. (1965). Скончыў Маскоўскі авіяц. ін-т (1959). З 1959 у ракетна-касм. карпарацыі «Энергія» імя С.П.Каралёва. З 1967 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю.А.Гагарына. 1—19.6.1970 з А.Р.*Нікалаевым* здзейсніў (як бортінжынер) палёт на касм. караблі (КК) «Саюз-9»; 24.5—26.7.1975 з П.І.*Клімуком* — палёт на КК «Саюз-18» (як бортінжынер) і арбітальнай станцыі «Салют-4». Правёў у космасе 80,7 сут. У 1975—87 камандзір атрада касманаўтаў-выпрабавальнікаў. Залатыя медалі імя К.Э.Цыялкоўскага АН СССР і імя Ю.А.Гагарына. Дзярж. прэмія СССР 1978.

У.С.Ларыёнаў.

Да арт. **Севастопальская абарона 1941—42.** Абарона Севастопаля. Мастак А.Дайнека. 1942.

СЕВАСЦЬЯ́НАЎ Фёдар Міхайлавіч (н. 21.3.1937, г. Данецк, Украіна), бел. спявак (бас). Засл. арт. Беларусі (1987). Скончыў Бел. кансерваторыю (1968; клас М.А.Зюванава). У 1961—62 артыст Шахцёрскага ансамбля песні і танца. З 1968 выкладчык Маладзечанскага муз. вучылішча. З 1973 саліст Бел. філармоніі. У рэпертуары бел., укр., рус. нар. песні, рамансы П.Булахава, А.Варламава, А.Даргамыжскага, М.Глінкі і інш., творы Ф.Шуберта, Р.Шумана і інш.

Л.А.Шымановіч.

СЕВАСЦЬЯ́НЕНКА Віктар Рыгоравіч (н. 31.1.1938, г. Бярдзянск Запарожскай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне цеплафізікі. Д-р фіз.-матэм. н. (1981), праф. (1984). Скончыў Маскоўскі энергет. ін-т (1963). З 1963 у Ін-це тэарэт. і прыкладной механікі Сіб. аддз. АН СССР. З 1982 у БПА (з 1984 заг. кафедры). З 1999 у ЗША. Навук. працы па радыяцыйным цеплаабмене і фізіцы плазмы, праблемах выкарыстання камп'ютэрнай тэхнікі ў навуч. працэсе. Распрацаваў метады разліку поля выпрамянення ў рэальным спектры, уліку ўзаемадзеяння часціц у плазме, методыку і апаратуру для цеплавога неразбуральнага кантролю прамысл. вырабаў.

Тв.: Радиационный теплоперенос в высокотемпературных газах. М., 1984 (у сааўт.); Оптимизация метода импульсной тепловой дефектометрии протяженных дефектов (у сааўт.) // Инж.-физ. журн. 1994. Т. 66, № 4.

СЕВЕ́НЫ (Cévennes), горы на ПдУ Францыі, платопадобная паўд.-ўсх. ўскраіна Цэнтр. Франц. масіву. Даўж. каля 150 км. Выш. да 1702 м (г. Лазер). Паўд. і ўсх. схілы стромка абрываюцца да Ронскай нізіны, паўн. і зах. — пакатыя. Складзены пераважна з гранітаў, гнейсаў, сланцаў, месцамі з вулканічных парод. Міжземнаморскія хмызнякі, вышэй шыракалістыя лясы (з каштану, буку) змяняюцца хвойнымі (з хвоі, елкі, піхты), на вяршынях — лугі. У далінах — вінаграднікі, сады. Нац. парк Севены (засн. ў 1970).

СЕВЕРАДАНЕ́ЦК, горад у Луганскай вобл. на Украіне. Размешчаны ў даліне р. Северскі Данец, каля чыг. станцыі Лісічанск. Каля 150 тыс. ж. (2001). Прам-сць: ВА «Азот» і «Шклопластык», прыладабудаванне, вытв-сць ЭВМ, дрэваапр., буд. матэрыялаў.

СЕВЕРАДЗВІ́НСК, горад у Архангельскай вобл. Расіі (да 1957 Молатаўск). Размешчаны на беразе Белага м., у дэльце р. Паўн. Дзвіна. 229 тыс. ж. (1999). Чыг. станцыя. Цэнтр падводнага атамнага суднабудавання. Прам-сць: дрэваапр., харч., абаронная. Ваенна-марская база падводных лодак. Тэатр. Захаваліся збудаванні Мікола-Карэльскага манастыра (згадваецца з 1419).

СЕ́ВЕРН (Severn), 1) рака ў Вялікабрытаніі. Даўж. 310 км (з эстуарыем 391 км), пл. бас. 21 тыс. км^2. Пачынаецца ў Кембрыйскіх гарах, ўпадае ў Брыстольскі зал. Атл. акіяна. Сярэдні расход вады каля 250 м^3/с. Злучана каналамі з рэкамі Тэмза, Трэнт, Мерсі. Суднаходная ад г. Стаўрпарт. На С. — гарады Шрусберы, Вустэр, Глостэр, у эстуарыі — Ньюпарт, Кардыф. 2) Рака ў Канадзе. Даўж. 981 км; пл. бас. 101 тыс. км^2. Вытокі на Лаўрэнційскім узв., перасякае шэраг азёр (Дыр, Санды і інш.), упадае ў Гудзонаў зал. Каля вусця г. Форт-Северн.

«СЕ́ВЕРО-ЗА́ПАДНАЯ ЖИЗНЬ», штодзённая грамадска-паліт. газета вялікадзяржаўнага шавіністычнага кірунку. Засн. 9(22).2.1909 у Вільні на рус. мове

пад назвай «Белорусская жизнь», выхад прыпынены на 1-м нумары, адноўлены 1(14).1.1911 у Вільні. 10(23).8.1911 перайменавана ў «С.-З.ж.». З 21.3(3.4). 1912 у Гродне, з сак. 1913 да 5(18).9.1915 у Мінску на рус. мове. Рэдактары-выдаўцы Л.М.Саланевіч, яго брат С.М.Саланевіч, сын І.Л. Саланевіч. Газета атрымлівала дзярж. субсідыю, была неафіц. урадавым органам на Беларусі і Літве. «С.-З.ж.» ідэалізавала старадаўнюю дапятроўскую Русь на чале з царом-самадзержцам і дарадчым Земскім саборам, прапагандавала утапічны ідэал «народнай манархіі», праслаўляла эпоху цара Аляксея Міхайлавіча. Адмаўляла этнічную, нац. і культ. самастойнасць бел. народа, прызнавала толькі рэгіянальныя асаблівасці краю. Вяла барацьбу з нац. адраджэннем, абвінавачвала газ. «Наша ніва», Я.Купалу, інш. пісьменнікаў у сепаратызме і дзярж. здрадзе. Нападала на крытычны рэалізм у л-ры, музыцы, выяўл. мастацтве, мадэрнізм, творчасць Л.Талстога, М.Горкага, К.Бальмонта і інш., крытыкавала сімвалізм і футурызм. *У.М.Конан.*

«СЕ́ВЕРО-ЗА́ПАДНОЕ СЛО́ВО», грамадска-паліт., эканам. і літ. газета. Выходзіла з 15(27).11.1898 да 29.11(12.12). 1905 у Вільні на рус. мове штодзённа. Прытрымлівалася кансерватыўна-асв., у 1905 памяркоўна-ліберальнага кірунку. Выступала за развіццё культуры на аснове класавага, нац. і рэліг. прымірэння. Беларусь лічыла «рускім краем», не прызнавала існавання бел. нацыі. Пад уплывам рэв. руху крытыкавала непаслядоўнасць дэмакр. рэформ у Расіі. Друкавала навук.-папулярныя нарысы пра дасягненні навукі, артыкулы па краязнаўстве, этнаграфіі, геаграфіі, медыцыне, літ.-крытычныя агляды, рэцэнзіі, інфармавала пра тэатр. і муз. жыццё ў краі. У перакладзе на рус. мову змяшчала творы польскіх, франц., ням. пісьменнікаў, нарысы пра творчасць М.Гогаля, І.Тургенева, Ф.Дастаеўскага, М.Някрасава і інш., адзначала папулярнасць і талент М.Горкага, у ліберальна-бурж. адаптацыі падавала думкі В.Бялінскага, А.Герцэна, М.Чарнышэўскага. Друкавала агляды віленскіх маст. выставак, падрыхтаваныя прапагандыстам сімвалізму Г.Каспяровічам. Публікавала творы Д.Бохана, у т.л. пераклад польскага верша Я.Лучыны «На могілках», нарыс пра творчасць У.Сыракомлі. Змясціла некралог «Ф.К.Багушэвіч» і арт. М.Радзіна «Памяці Ф.К.Багушэвіча», характарызавала яго як адваката і гуманнага чалавека. *У.М.Конан.*

«СЕ́ВЕРО-ЗА́ПАДНОЕ СЛО́ВО», грамадска-паліт. газета акцябрысцкага кірунку. Выдавалася з 10(23).11.1915 да 30.4(13.5).1916 у Мінску на рус. мове штодзённа. Падтрымлівала палітыку ўрада, асвятляла дзейнасць цэнтр. і мясц. органаў улады. Друкавала паведамленні пра ваен. дзеянні ў Расіі і яе саюзнікаў у час 1-й сусв. вайны. Прапагандавала ідэю сац. і нац. міру, адзінага патрыят. фронту для перамогі ў вайне. Адмаўляла нац. і культ. самастойнасць беларусаў. Інфармавала пра тэатр. і муз. жыццё ў Мінску. Друкавала вершы і нарысы мясц. аўтараў, якія з рэліг. і патрыят. пазіцый сцвярджалі ўпэўненасць у ваен. перамозе Расіі. Спрабавала выкарыстаць класічную л-ру з кансерватыўна-ахоўніцкімі мэтамі, І.Тургенева і інш. рус. пісьменнікаў называла «вялікімі нацыяналістамі зямлі рускай». Вяла палеміку з газ. «Минский голос», «Минская газета-копейка» і «Варшавское утро» па ідэалаг. матывах і з-за канкурэтных меркаванняў. *У.М.Конан.*

«СЕ́ВЕРО-ЗА́ПАДНЫЙ ГО́ЛОС», грамадска-паліт. і літ. газета ліберальнага кірунку. Выдавалася з 4(17).12.1905 да 1(14).1.1915 у Вільні на рус мове штодзённа. Працягвала праграму віленскай газ. *«Северо-Западное слово»* ў больш радыкальным кірунку, асабліва ў перыяд рэвалюцыі 1905—07. Асвятляла рэв. рух у краі, крытыкавала сац. несправядлівасць капіталізму, апартунізм і непаслядоўнасць бурж. лібералізму, выкрывала вялікадзярж. палітыку чарнасоценцаў і акцябрыстаў, польскіх нацыяналістаў. У гады рэакцыі прытрымлівалася тактыкі асцярожнай апазіцыі да царызму. Мела аддзелы «Тэатр і музыка», «Бібліяграфія», рэцэнзавала спектаклі, канцэрты, маст. і навук. л-ру. Змяшчала творы Л.Андрэева, М.Горкага, А.Купрына, Л.Талстога, А.Чэхава, Шолам-Алейхема, а таксама польскіх (Э.Ажэшка, У.Рэймант), франц. (Гі дэ Мапасан, Э.М.Прэво), амер. (М.Твэн), аўстр. (Р.М.Рыльке, А.Шніцлер) і інш. пісьменнікаў. Прапагандавала рэаліст. традыцыі айч. л-ры. Станоўча ацэньвала творчасць пісьменнікаў М.Гогаля, Т.Шаўчэнкі, М.Салтыкова-Шчадрына, А.Герцэна, М.Чарнышэўскага, артыстаў В.Камісаржэўскай, Ф.Шаляпіна. Негатыўна ставілася да сімвалізму, натуралізму, дэкадэнцкіх плыняў у мастацтве. Выказвалася за права беларусаў на сваю нац. культуру. Паведамляла пра заснаванне, дзейнасць, судовае праследаванне газ. «Наша ніва», пра стварэнне бел. культ.-асв. арг-цый, бел. тэатр.-муз. вечары, дзейнасць Бел. тэатр.-муз. гуртка. Апублікавала арт. У.Самойлы (пад псеўд. У.Суліма) у абарону моўна-нац. самавызначэння беларусаў. Друкавала вершы і пераклады мясц. літаратараў. *У.М.Конан.*

«СЕ́ВЕРО-ЗА́ПАДНЫЙ КРАЙ», грамадска-паліт. і літ. газета радыкальна-ліберальнага, з сярэдзіны 1904 рэв.-дэмакр. кірунку, у 1905 трыбуна мясц. арг-цыі РСДРП. Выдавалася з 1(14).11.1902 да 8(21).12.1905 у Мінску на рус. мове штодзённа. Рэдактар-выдавец М.Мысаўской, з 28.10.1905 выдавец В.Мысаўская, рэдактар І.Фацінскі. Узнікла на аснове пашырэння праграмы газ. *«Минский листок»*. Выступала ў абарону сац.-паліт. і эканам. правоў працоўных, змагалася за дэмакратыю і нац. раўнапраўе. Інфармавала пра ўнутр. і міжнар. стновішча краіны, крытычна асвятляла дзейнасць урада і мясц. улад. Пад уплывам рэв. сітуацыі перайшла ад прапаганды ліберальных рэформ да радыкальнай крытыкі сац.-паліт. ладу Расіі. Перадрукоўвала або пераказвала Праграму РСДРП, артыкулы У.І.Леніна. За газетай быў наладжаны сакрэтны нагляд, на яе рэдактара і супрацоўнікаў ішлі даносы ў сталіцу. У ліп. 1905 Мысаўской быў арыштаваны, а выданне газеты прыпынена. Паводле Маніфеста 17 кастр. 1905 і пад уплывам рэв. руху ў Мінску газета адноўлена. Яна прапагандавала рэалістычныя і дэмакр. традыцыі ў мастацтве, рус. класічную л-ру, творчасць А.Пушкіна, М.Гогаля, В.Бялінскага, М.Чарнышэўскага, І.Тургенева, А.Чэхава, У.Караленкі, Л.Талстога, М.Горкага, Л.Андрэева, асвятляла тэатр. і муз. жыццё Мінска, друкавала ў пераказе даклады і дыскусіі на сходах Мінскага т-ва аматараў прыгожых мастацтваў, творы мясц. аўтараў (Д.Бохана, А.Пшчолкі, Я.Окуня і інш.). Мела рубрыкі «Кніжны агляд», «Навуковыя гутаркі». Апублікавала даследаванне Л.Аксельрод (пад псеўд. Артадокс) «Аб праблемах ідэалізму», нарысы Д.Мейчыка па гісторыі права, верш Я.Купалы «Мужык» — першы друкаваны твор паэта, нарысы і бел. легенды ў запісах К.Каганца, адзначала папулярнасць вершаў Цёткі (А.Пашкевіч) «Хрэст на свабоду», «Пад штандарам».

Літ.: Рожин Н.В. Газета «Северо-Западный край»: Очерк обществ.-полит., филос. и эстет. позиции, 1902—1905 гг. Мн., 1970; Конон В.М. Проблемы искусства и эстетики в общественной мысли Белоруссии начала XX в. Мн., 1985. *У.М.Конан.*

№ 746. Воскресенье, 15 мая 1906 г. Годъ XX № 746. Воскресенье, 15 мая 1905 г.
СѢВЕРО-ЗАПАДНЫЙ КРАЙ
ВЫХОДИТЪ въ Минскѣ губ. ЕЖЕДНЕВНО
СТРОИТЕЛИ ЖИЗНИ
Минскій пѣтній театръ
Іудейскій Король Лиръ
Въ Минскомъ Общественномъ Собраніи сдается содержаніе БУФЕТА
РЕСТОРАНЪ
З. Б. ПРОТАСЪ
Реалей и Піанино
15 лѣтъ практики.

СЕ́ВЕРСКАЕ КНЯ́СТВА, Ноўгарад-Северскае княства, адно з удзельных княстваў Чарнігаўскай (Чарнігава-Северскай) зямлі з цэнтрам у Ноўгарад-Северскім. Узнікла ў 1096 на тэр. *севяран*. Размяшчалася ў бас. р. Дзясны і яе прытокаў Снова, Сейма і інш.; у склад С.к. часова ўваходзілі вярхоўі Акі і Дзясны, т.зв. «краіна *вяцічаў*». Першым князем быў *Алег Святаславіч*, потым яго нашчадкі — Ольгавічы. У 2-й пал. 12 ст. северскія князі вялі барацьбу з полаўцамі і інш. плямёнамі качэўнікаў, адзін з эпізодаў якой (паход кн. *Ігара Святаславіча* 1185) адлюстраваны

ў «*Слове аб палку Ігаравым*». У 1238 (пасля мангола-тат. нашэсця) тэр. С.к. ўвайшла ў склад *Бранскага княства*, у 2-й пал. 14 ст. далучана да ВКЛ. Паводле *Андросаўскага перамір'я 1667* тэр. С.к. перайшла да Расіі.

СЕ́ВЕРСКІ ДАНЕ́Ц (няправільная назва Паўночны Данец), рака ў Расіі і Украіне, правы прыток р. Дон. Даўж. 1053 км, пл. бас. 96,9 тыс. км^2. Вытокі на Сярэднярускім узв., каля вусця падзяляецца на 3 рукавы. Ніжнія 240 км каналізаваныя. Асн. прытокі: Аскол, Айдар, Калітва (злева). Сярэдні расход вады каля с. Кружылаўка 149 м^3/с. Ледастаў ад снеж.—студз. да канца лютага — пач. красавіка. У верхнім цячэнні Печанежскае вадасх.; каля г.п. Райгарадок пачынаецца канал С.Д.—Данбас. Суднаходная на 315 км ад вусця. На С.Д. — гарады Белгарад, Каменск-Шахцінскі (Расія), Ізюм, Лісічанск (Украіна) і інш. На левабярэжжы Луганскі запаведнік.

СЕ́ВЕРЦАВА ЗАКО́Н, закон зменны фаз (напрамкаў) эвалюцыі, правіла чаргавання галоўных напрамкаў эвалюцыі: у гісторыі монафілетычнай (гл. *Монафілія*) групы арганізмаў за перыядам буйных эвалюц. перабудоў — *арамарфозу* (арагенезу) заўсёды настае перыяд асобных прыстасаванняў — *алагенезаў* (аламарфозаў), *катагенезаў*, *гіпергенезаў* і інш. Асваенне новага асяроддзя або буйныя морфафізіял. пераўтварэнні вядуць да ўспышкі *відаўтварэння*. Сфармуляваў А.М.*Северцаў* (1925). Уклад у распрацоўку С.з. зрабіў І.І.*Шмальгаўзен*.

СЕ́ВЕРЦАЎ Аляксей Мікалаевіч (23.9.1866, Масква — 19.12.1936), расійскі біёлаг, заснавальнік эвалюц. марфалогіі жывёл. Акад. АН СССР (1920) і АН УССР (1925). Сын М.А.*Северцава*. Скончыў Маскоўскі ун-т (1890). Вучань М.А.*Мензбіра*. З 1898 праф. Юр'еўскага, з 1902 Кіеўскага, у 1911—30 Маскоўскага ун-таў. Навук. працы па параўнальнай анатоміі і эмбрыялогіі пазваночных жывёл, заканамернасцях эвалюц. працэсу. Аднавіў філагенет. дрэва ніжэйшых пазваночных, прапанаваў тэорыю філэмбрыягенезу, распрацаваў вучэнне пра біял. прагрэс, тыпы філагенет. змен органаў і функцый. Змену асяроддзя лічыў адзінай прычынай філагенет. пераўтварэнняў. Адкрыў *Северцава закон*.

СЕ́ВЕРЦАЎ Мікалай Аляксеевіч (5.11.1827, г. Варонеж, Расія — 7.2.1885), расійскі заолаг, зоагеограф і падарожнік. Скончыў Маскоўскі ун-т (1846). У 1857—79 даследаваў Сярэднюю Азію. Вывучаў геалогію, араграфію, клімат, глебы, расліннасць і жывёл цэнтр. ч. Цянь-Шаня, пустыні Кызылкум, Памір а і інш., стварыў першыя комплекснагеагр. характарыстыкі прыроды гэтых тэрыторый. Навук. працы па зоагеагр. раянаванні Палеарктыкі. Яго імем названы пік на Памірах ў хр. Пятра Першага, ледавікі на Памірах і Заілійскім Алатау, некат. віды жывёл і раслін.

СЕВЕ́РЫ (Severi), дынастыя рым. імператараў у 193—235. Да С. належалі *Септымій Север* [193—211], Каракала [211—217], Гета [211—212], Элагабал [Геліягабал; 218—222], Аляксандр Север [222—235]. С. стварылі ваен.-бюракратычную манархію, абаранялі інтарэсы шырокіх пластоў рабаўладальнікаў, абмяжоўвалі ўладу буйных землеўладальнікаў. Палітыка С. (за выключэннем Аляксандра Севера) мела антысенацкі характар. Апошні імператар Аляксандр Север пайшоў на ўступкі зямельнай арыстакратыі, што выклікала незадаволенасць арміі і стала прычынай яго забойства.

СЕВЕРЫ́НІ (Severini) Альда (н. 20.11.1926, г. Анкона, Італія), італьянскі паэт. У 2-ю сусв. вайну ўдзельнік Руху Супраціўлення. Аўтар зб-каў вершаў «Прыйдзе, як зара, твой час» (1955), «Мне не трэба віна, каб пець» (1962), «З берага на бераг» (1972), «Слова В'етнаму», «Вершы Іспаніі» (абодва 1974), «На арбіце Зямлі» (1979), «Элементы фантастычнай анатоміі» (1980), «Арыфметыка дыялога» (1983) і інш. Двойчы наведаў Беларусь. Пераклаў на італьян. мову паасобныя вершы Я.Купалы, М.Танка, Р.Барадуліна, М.Калачынскага. Сярод перакладчыкаў яго твораў на бел. мову М.Танк, Барадулін, Я.Семяжон, А.Шаўня.

Тв.: Бел. пер. — На арбіце Зямлі. Мн., 1980; У кн.: Золата Фарчэлы. Мн., 1968; У кн.: Ад вежаў Ферары. Мн., 1974. *А.А.Шаўня.*

СЕВІ́ЛЬСКАЯ ШКО́ЛА ЖЫ́ВАПІСУ, адна з асн. маст. школ Іспаніі ў 15—17 ст. з цэнтрам у г. Севілья. Творы мастакоў С.ш. А.Фернандэса, Ф. дэ Эрэры Старэйшага, Х. дэ Раэласа, Ф.Пачэкі адметныя пачуццёвай дакладнасцю ў адлюстраванні рэчаіснасці. Найб. росквіту дасягнула ў 17 ст. ў творчасці Д.*Веласкеса*, Ф.*Сурбарана*, Б.Э.*Мурыльё*. Гэтаму перыяду ўласцівы глыбокі дэмакратызм вобразаў, канкрэтнасць маст. мовы, увага да праблем каларыту і святлаценю. *Я.Ф.Шунейка.*

СЕВІ́ЛЬЯ (Sevilla), горад на Пд Іспаніі. Адм. ц. аўт. вобл. Андалусія і прав. Севілья. Каля 700 тыс. ж. (2001). Порт на р. Гвадалквівір, даступны для марскіх суднаў (аванпорты на Атлантычным ак. — Таблада і Муэльес-дэ-лас-Дэлісіяс). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Важны гандл. і прамысл. цэнтр. Прам-сць: маш.-буд. (электратэхн., судна- і авіябудаванне, вытв-сць с.-г. машын), харчасмакавая (вінаробчая, тытунёвая, мукамольная і інш.), тэкст., хім. і нафтахімічная. Ун-т (з 1502). Турызм.

Да арт. **Севільская школа жывапісу**. Д.Веласкес. Вакх. 1630.

Да арт. **Севільская школа жывапісу**. Б.Э.Мурыльё. Адпачынак на шляху ў Егіпет. 1665—70.

У старажытнасці С. (Гіспаліс) — цэнтр іберыйскага племя турдэтанаў. Пасля зававання рымлянамі (3 ст.) сталіца рым. правінцыі Бетыка. У 411 заваявана вандаламі, у 441 — вестготамі. У 712—1248 падпарадкавана арабамі, з 1026 цэнтр аднайм. эмірата. У 1248 адваявана ў арабаў каралём Кастыліі Фердынандам III. У 14—15 ст. з С. накіроўваліся ваен. экспедыцыі супраць Гранадскага эмірата. У 15 ст. буйны цэнтр суднабудавання, гандлю, мараплаўства. З гавані С. (Палас) адправілася 1-я экспедыцыя Х.*Калумба*. Найб. росквіт С. прыпадае на 16—17 ст., калі яна мела манаполію каланіяльнага гандлю і па та-

Севілья. Сабор.

вараабароце пераўзыходзіла ўсе еўрап. гандл. цэнтры. У 18 ст. пасля адмены гандл. манаполіі страціла б. значэнне. У 1810—12 і 1820—23 акупіравана франц. войскамі. У грамадз. вайну 1936—39 цэнтр франкістаў.

У старой частцы С. — лабірынт вузкіх звілістых вуліц, на З і ПдУ ад яго — рэгулярная забудова. Захаваліся сцены і бастыёны маўрытанскага замка Алькасар (канец 12 ст., прыбудовы 14—16 ст.), сабор (1402—1506, позняя готыка; купал 1519; у інтэр'еры багаты збор твораў іісп. мастацтва 16—18 ст.), гатычныя касцёлы 13—14 ст., саборная званіца «Ла Хіральда» (1184—16 ст., выш. 97,52 м), вежа «Торэ дэль Ора» (1220), будынкі «Каса дэ Пілатас» (15 ст. — 1553, спалучэнне стыляў мудэхар і палымянай готыкі) і «Каса Лонха» (біржа; 1583—98), касцёлы 17—18 ст. у стылі чурыгерэска. Музеі: правінцыяльны археал., Дом-музей Б.Э.Мурыльё. Помнікі архітэктуры С. ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

Літ.: Никитюк О.Д. Кордова, Гранада, Севилья — древние центры Андалусии. М., 1972.

СЕВЯРА́НЕ, усходне-славянскія плямёны, якія ў канцы 1-га тыс. н.э. жылі ў басейнах рэк Дзясна, Сейм, Сула, Ворскла, Псёл, Северскі Данец. Межавалі на З з *палянамі*, *дрыгавічамі*, на Пн з *радзімічамі* і *вяцічамі*, на У і Пд з качавымі плямёнамі. У 8 — пач. 9 ст. плацілі даніну хазарам. У канцы 9 ст. заходнія С. разам з палянамі ўвайшлі ў склад *Кіеўскай Русі*, усходнія С. да канца 10 ст. захоўвалі адносную аўтаномію. У 11—12 ст. С. склалі значную ч. насельніцтва Чарнігаўскай (Северскай) зямлі. У 907 удзельнічалі ў паходзе Алега на Візантыю. Упамінаюцца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 884, 885 і пад 1024. Найб. гарады С. — Чарнігаў, Ноўгарад-Северскі, Сноўск, Пуціўль, Курск і інш. Характэрныя племянныя адзнакі — спіралепадобныя і прамянёвыя скроневыя кольцы, пласціністыя галаўныя венчыкі. У 1096 на землях С. ўзнікла *Северское княство*.

Літ.: Седов В.В. Восточные славяне в VI—XIII вв. М., 1982.

СЕВЯРА́НІН Віталь Сцяпанавіч (н. 21.3.1937, г. Іркуцк, Расія), бел. вучоны ў галіне цеплаэнергетыкі. Д-р тэхн. н. (1987), праф. (1989). Скончыў БПІ (1960). З 1973 у Брэсцкім тэхн. ун-це (у 1979—87 заг. кафедры, з 1991 кіраўнік лабараторыі «Пульсар»). Навук. працы па праблемах гарэння розных відаў паліва, цепламасаабмену і асновах энергазберажэння. Выявіў слаявое пульсуючае гарэнне і ўстанавіў для яго фазавыя суадносіны. Даследаваў асаблівасці абдзімання паліва пульсуючым патокам, прапанаваў канструкцыі энергазберагальных апаратаў і машын.

Тв.: Технологическое пульсационное горение. М., 1993 (у сааўт.); Основы энергосбережения. Брест., 1998; Инженерно-техническое оборудование зданий. Мн., 2000 (разам з В.М.Яромскім, М.І.Кірылюком).

СЕВЯРА́НІН Ігар (сапр. Лотараў Ігар Васілевіч; 16.5.1887, С.-Пецярбург — 20.12.1941), рускі паэт. Друкаваўся з 1904. Стваральнік эгафутурызму (гл. *Футурызм*). Эстэтызацыя салонна-гарадскіх матываў, гульня ў рамант. індывідуалізм у зб-ках «Громакіпячы кубак» (1913), «Залаталіра» (1914), «Ананасы ў шампанскім», «Паэзаантракт» (абодва 1915) і інш. З 1918 жыў у Эстоніі. У аўтабіягр. рамане ў вершах «Званы сабора пачуццяў» (1925) і зб. санетаў «Медальёны. Сюжэты і варыяцыі пра паэтаў, пісьменнікаў і кампазітараў» (1934) настальгія па радзіме. Аўтар паэт. зб-каў «Збор паэз» (т. 1—4, 1918), «Салавей» (1923) і інш. Паэзіі С. ўласцівы лірычнасць, музычнасць, разнастайнасць рытмаў, неалагізмы (у т.л. «окрылить», «бездарь»), дакладнасць сатыр. замалёвак. Перакладаў на рус. мову А.Міцкевіча, Ш.Бадлера, П.Верлена, эст. пісьменнікаў.

Тв.: Сирень моей весны: Избр. лирика. Кемерово, 1989; Стихотворения и поэмы, 1918—1941. М., 1990; Ананасы в шампанском: Поэзы. М., 1991; Лирика. Мн.; М., 2000.

Літ.: Венок поэту: (Игорь Северянин). Таллинн, 1987.

СЕВЯРГІ́Н Васіль Міхайлавіч (19.9.1765, С.-Пецярбург — 29.11.1826), рускі мінералог і хімік. Скончыў ун-т у Пецярбургу. Удасканальваў веды ў Гётынгенскім ун-це ў Германіі (1785—89). Акад. Пецярбургскай АН (1793). Ганаровы член многіх рус. і замежных навук. т-ваў, у т.л. Віленскага ун-та (1803). У працах «Першыя асновы мінералогіі або натуральнай гісторыі выкапнёвых цел» (кн. 1—2, 1798) і «Спроба мінералагічнага землеапісання Расійскай дзяржавы» (ч. 1—2, 1809) даў самыя поўныя на той час звесткі па мінералогіі, пра мінералы і карысныя выкапні Расіі. Аўтар «Падрабязнага слоўніка мінералагічнага...» (т. 1—2, 1807). Пасля паездак (1802 і 1803) у бел. губерні даў іх прыродазнаўчае і этнагр. апісанне ў «Запісках падарожжа па заходніх правінцыях Расійскай дзяржавы...» (1803) і «Працягу запісак...» (1804).

Літ.: Дорошевич Э.К. Философия эпохи Просвещения в Белоруссии. Мн., 1971; Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. Мн., 1980. *С.А.Кузняева.*

В.П.**Севярдэнка**.

СЕВЯРДЭ́НКА Васіль Пятровіч (14.1.1904, г. Краматорск Данецкай вобл., Украіна — 19.12.1978), бел. вучоны ў галіне металазнаўства. Акад. АН Беларусі (1956), д-р тэхн. н. (1950), праф. (1952). Засл. дз. нав. і тэхн. Беларусі (1963). Скончыў Маскоўскі ін-т сталі (1932). З 1945 выкладаў у ВНУ Масквы. З 1957 дырэктар, заг. лабараторыі пластычнасці, з 1970 старшы навук. супрацоўнік-кансультант Фізіка-тэхн. ін-та АН Беларусі, адначасова ў 1957—70 заг. кафедры БПІ. Навук. працы па пластычнай дэфармацыі, апрацоўцы металаў ціскам. Прапанаваў новыя спосабы апрацоўкі металаў з выкарыстаннем ультрагуку, распрацаваў метады гарачага гідрахім. выціскання, пракаткі лістоў з парашковых матэрыялаў. Дзярж. прэмія Беларусі 1984.

Тв.: Теория обработки металлов давлением. Мн., 1966; Теоретические основы ковки и горячей объемной штамповки. Мн., 1968 (у сааўт.); Основы теории прокатки. Мн., 1969; Прокатка и волочение с ультразвуком. Мн., 1970 (разам з У.У.Клубовічам, А.В.Сцепаненкам); Ультразвук и пластичность. Мн., 1976 (з імі ж).

Літ.: Библиография научных трудов академика АН БССР В.П.Северденко. Мн., 1979.

СЕВЯРНЁЎ Міхаіл Максімавіч (н. 21.11.1921, в. Север Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі. Акад. УАСГНІЛ (1978, чл.-кар. 1972), Рас. акадэміі с.-г. навук (1992), Акадэміі агр. навук Беларусі (1992). Д-р тэхн. н. (1966), праф. (1969). Скончыў БПІ (1951). У 1954—72 і ў 1976—83 у мінскім Цэнтр. НДІ механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі Нечарназёмнай зоны СССР (з 1965 і з 1976 дырэктар). У 1972—76 нам. Старшыні СМ БССР. З 1992 віцэ-прэзідэнт, з 1996 саветнік прэзідыума Акадэміі агр. навук Беларусі. Навук. працы па праблемах эксплуатацыі с.-г. тэхнікі, узнаўляльных крыніц энергіі і энергарэсурсазбераж-

ня. Распрацаваў навук. асновы надзейнасці і даўгавечнасці с.-г. машын, метады іх аднаўлення, выкарыстання традыц. і нетрадыц. энерганосьбітаў. Дзярж. прэмія Беларусі 1978.

Тв.: Работоспособность и сохранность сельскохозяйственной техники. Мн., 1980 (у сааўт.); Энергосберегающие технологии в сельскохозяйственном производстве. Мн., 1994.

СЕГА́Л, бел. мастак 2-й пал. 18 ст. Родам з г. Слуцк Мінскай вобл. У 1760 размаляваў інтэр'ер сінагогі ў Магілёве.

СЕГАНЦІ́НІ (Segantini) Джавані (15.1.1858, г. Арка, Італія — 28.9.1899), італьянскі мастак. Вучыўся ў акадэміі Брэра ў Мілане (1876—78). З 1885 жыў у Швейцарыі. У ранняй творчасці зазнаў уплыў Ж.Ф.Міле, арыентаваўся на натуралізм і эфекты люмінізму («Аве Марыя», 1882). У 1887—90 пісаў кампазіцыі з рытмічнымі і геам. элементамі, светлым каларытам у духу пуантылізму («Маладая пастушка», 1887—88; «Дзве маці», 1890). З 1890 звярнуўся да сімвалізму. У большасці работ фонам з'яўляецца альпійскі пейзаж. Творам уласцівы дэкар. рытмы, напоўненыя містычнымі або сімвалічнымі элементамі, своеасаблівае асвятленне, якое ўзмацняе падзел тонаў: «Анёл жыцця» (1894), «Любоў да вытокаў жыцця», «Паша вясной» (абодва 1896), «Багіня кахання» (1894—97), «Альпійскі трыпціх» (1886—99), «Партрэт Казірагі Арыяні» (1899).

Я.Ф.Шунейка.

СЕГВО́ЗЕРА, возера ў Карэліі, у Расіі, у 1957 ператворана ў вадасховішча (пл. 815 км^2). Пл. да стварэння вадасховішча 753 км^2 (з астравамі), глыб. да 97 м. Берагі парэзаныя, больш за 70 астравоў. Выцякае р. Сегежа, якая ўпадае ў Выгвозера. Ледастаў ад снеж. да мая.

СЕ́ГЕД (Szeged), горад на Пд Венгрыі, на р. Ціса. Адм. ц. медзьё Чонград. Каля 180 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог, рачны порт. Аэрапорт. Эканам. і культ. цэнтр ПдУ краіны. Прам-сць: харч., тэкст., швейная, дрэваапр., гарбарна-абутковая, маш.-буд., гумавая. Ун-т. Музеі, тэатры. Арх. помнікі 13—16 ст. Паблізу здабыча нафты і прыроднага газу; арніталаг. запаведнік. Штогадовы фестываль Сегедскія тэатральныя гульні.

СЕ́ГЕРС (Seghers) Херкюлес Пітэрс (1589 або 1590, г. Харлем, Нідэрланды — каля 1638), галандскі мастак. Да 1606 вучыўся ў Г. ван Конінксла ў Амстэрдаме. Працаваў у Харлеме, Амстэрдаме, Утрэхце, Гаазе (з 1632 або 1633). Яго жывапісныя пейзажы («Від Рэнена», «Раўнінны пейзаж», «Дамы і вёска ў рачной даліне», «Горны пейзаж») і выкананыя ў тэхніцы каляровага афорта («Пейзаж з вялікім дрэвам», «Вялікія караблі», «Марская бура») вылучаюцца шырынёй і манументальнасцю, схаваным драматызмам светлавых і фактурных эфектаў, у гравюрах — выразнасцю дынамічнага ломкага штрыха. Значна паўплываў на творчасць *Рэмбранта*, Я. ван *Ройсдала* і інш.

Я.Ф.Шунейка.

СЕ́ГЕРСТАМ (Segerstam) Лейф Селім (н. 2.3.1944, г. Васа, Фінляндыя), фінскі дырыжор, кампазітар. Скончыў Акадэмію музыкі імя Я.Сібеліуса (1963), Джульярдскую муз. школу ў Нью-Йорку (1965). З 1966 гал. дырыжор Фін. нац. оперы. З 1968 дырыжор Швед. каралеўскай оперы ў Стакгольме (з 1970 гал. дырыжор, з 1971 яе музік-дырэктар). З 1971 у т-рах «Ковент-Гардэн», «Метраполітэн-опера», выступаў з рознымі еўрап. аркестрамі, у т.л. на Зальцбургскіх фестывалях. З сярэдзіны 1970-х г. пастаянны дырыжор сімф. аркестра Фін. радыё ў Хельсінкі, Аўстр. радыё ў Вене, кіраўнік «Сегерстам-квартэта». Аўтар 4 балетаў, п'есы для сімф. і стр. арк., канцэрта для скрыпкі з арк. (1967), 12 стр. квартэтаў (1962—77), тв. для голасу з арк. і з фп. і інш. Яго мастацтва адметнае эмацыянальнасцю, навізной інтэрпрэтацый.

СЕГЕТА́ЛЬНЫЯ РАСЛІ́НЫ (ад лац. segetalis які расце сярод збажыны), расліны ў пасевах с.-г. культур, жыццёвы цыкл якіх прыстасаваны да пэўных культур і звязаны з іх цыклам развіцця. Напр., рыжак ільняны і жыцік ільняны сустракаюцца толькі ў пасевах лёну, а брыца рысавая — у пасевах рысу. Зрэдку тэрмін «С.р.» ўжываюць як сінонім *пустазелля*.

СЕГІДЫ́ЛЬЯ (ісп. seguidilla), іспанскі нар. танец-песня. Муз. памер 3/4. Тэмп жывы. Узнік у Кастыліі ў 15—16 ст. Мае рэгіянальныя разнавіднасці, гал. з якіх мурыйская і севільская. Тэксты пераважна лірычныя ці жартоўныя. Выконваецца пад акампанемент гітары, бандур і кастаньет.

СЕГМЕ́НТ (лац. segmentum адрэзак, паласа ад seco рэжу, рассякаю), 1) С. на плоскасці — плоская фігура, якая знаходзіцца паміж крывой і яе *хордай*. Напр., С. *круга* — частка круга, абмежаваная дугой ABC і хордай AC. 2) С. у прасторы — частка цела, абмежаваная плоскасцю і кавалкам паверхні, які адсякаецца гэтай плоскасцю. 3) С. — тое, што *адрэзак*.



Сегмент круга.

СЕГМЕНТА́ЦЫЯ, гл. ў арт. *Метамерыя*.

СЕГНЕ́ТАВА СОЛЬ, падвойная натрыева-каліевая соль віннай кіслаты $KOOC(CHOH)_2COONa{\cdot}4H_2O$. Адкрыта франц. аптэкарам Э.Сеньетам (1655) і названа яго імем. Бясколерныя крышталі, якія добра растваряюцца ў вадзе (1390 г/л пры 30 °С). Шчыльнасць 1776 кг/м^3, $t_{пл}$=55,6 °С, малекулярная маса 282,12. Ад тэрміна «С.с.» паходзіць назва класа рэчываў са своеасаблівымі дыэлектрычнымі ўласцівасцямі, якія выяўлены ў гэтай солі (гл. *Сегнетаэлектрыкі*).

Дж.Сеганціні. Любоў да вытокаў жыцця. 1896.

Х.Сегерс. Горны пейзаж.

СЕГНЕТАПАЎПРАВАДНІКІ́, крышталічныя матэрыялы, якія спалучаюць уласцівасці *сегнетаэлектрыкаў* і *паўправаднікоў*. Тыповыя С.: ёдыд-сульфід сурмы SbSI, тытанат барыю $BaTiO_3$. Сегнетаэл. і паўправадніковыя ўласцівасці С. узаемна звязаны: пры змене канцэнтрацыі носьбітаў зараду (асвятленнем, награваннем, легіраваннем) назіраецца змена сегнетаэл. уласцівасцей (напр., змена даменнай структуры, зрух пункта Кюры і інш.). У прыватнасці, у С. назіраецца хуткая змена аптычных характарыстык пры асвятленні, напр., *падвойнага праменепераламлення* (фотарэфрактыўны эфект), што застаецца і пасля спынення асвятлення. У сваю чаргу спантанная палярызацыя, нелінейнасць дыэлектрычнай пранікальнасці (сегнетаэл. ўласцівасці С.) абумоўліваюць электронныя працэсы ў С., не тыповыя для звычайных паўправадніко́ў, напр., істотнае адрозненне паверхневай праводнасці ад аб'ёмнай. Выкарыстоўваюцца ў галаграфічных прыладах, тэрмарэгулятарах, тэрмакампенсатарах, сістэмах аптычнай памяці і інш.

Літ.: Фридкин В.М. Сегнетоэлектрики — полупроводники. М., 1976.

П.А.Пупкевіч.

СЕГНЕТАЭЛА́СТЫК, фераэластык, дыэлектрычны монакрышталь, асобныя вобласці якога (сегнетаэластычныя *дамены*), адрозніваюцца спантаннай (самаадвольнай) дэфармацыяй крышталічнай рашоткі. Такая дэфармацыя ўзнікае пры зніжэнні т-ры ў выніку фазавага пераходу з зыходнай (параэластычнай) фазы ў менш сіметрычную сегнетаэластычную фазу.

С. у сегнетаэластычнай фазе з'яўляецца мех. аналагам *сегнетаэлектрыкаў* і *ферамагнетыкаў*: крышталь разбіваецца на дамены з аднолькавай арыентацыяй спантаннай дэфармацыі; знешняе мех. напружанне можа зрушаць межы даменаў, пераводзіць крышталь з полідаменнага стану ў монадаменны, пераключаць крышталь з аднаго монадаменнага стану ў другі. Пры гэтым залежнасць дэфармацыі ад знешняга напружання мае выгляд пятлі *гістэрэзісу*. Некат. С. адначасова з'яўляюцца сегнетаэлектрыкамі (напр., сегнетава соль, дыгідрафасфат калію). С. выкарыстоўваюцца пры стварэнні кіроўных ліній затрымкі, акустаэл. і акустааптычных прылад апрацоўкі, мадуляцыі і фільтрацыі сігналаў, а таксама ў розных пераўтваральніках і прывадах.

СЕГНЕТАЭЛЕ́КТРЫКІ, фераэлектрыкі, дыэлектрычныя і паўправадніковыя крышталі, якія ў пэўным інтэрвале т-р (у сегнетаэлектрычнай фазе) пры адсутнасці знешніх палёў маюць спантанную (самаадвольную) палярызацыю (гл. *Палярызацыя дыэлектрыкаў*); асобная група піраэлектрыкаў (гл. *Піраэлектрычнасць*). Палярызацыя С. абумоўлена зрушэннем іонаў крышталічнай рашоткі адносна іх месцазнаходжання ў непалярызаваных крышталях, а таксама ўпарадкаваннем атамных груп, якія маюць эл. дыпольныя моманты.

Характэрныя асаблівасці С. у сегнетаэлектрычнай фазе (наяўнасць *даменаў*, *сегнетаэлектрычнага гістэрэзіса*, вял. *дыэлектрычнай пранікальнасці*, залежнай ад напружанасці эл. поля, і інш.) выяўлены ў *сегнетавай солі* (адсюль назва). У некат. крышталяў такая фаза назіраецца пры т-рах, меншых за *Кюры пункт*, вышэй якога С. страчваюць свае спецыфічныя ўласцівасці; існуюць крышталі, дзе яна абмежавана з двух бакоў пунктамі Кюры; некат. крышталі не маюць пункта Кюры і вобласць існавання сегнетаэл. фазы супадае з тэмпературнай вобласцю існавання крышталя; многія крышталі маюць некалькі сегнетаэл. фаз, якія адрозніваюцца рознай арыентацыяй *палярызаванасці*. Вядома некалькі сотень С., якія класіфікуюць паводле характару фазавага пераходу ў пункце Кюры, сіметрыі крышталёў і інш. З С. найб. вывучаны ніабат літыю, тытанаты барыю і стронцыю і інш. С. выкарыстоўваюцца ў розных галінах навукі і тэхнікі для ўзаемнага пераўтварэння гукавых і эл. сігналаў, вымярэння т-ры і ціску, у прыёмніках эл.-магн. хваль і інш. Гл. таксама *Сегнетаэлектрычнасць*.

На Беларусі даследаванні па фізіцы С. вядуцца з 1950-х г. у Ін-це фізікі Нац. АН пад кіраўніцтвам М.М.*Сіраты*; з 1960-х г. — таксама ў БДУ, Бел. пед. ун-це, Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі і інш. Эксперыментальна даследаваны асаблівасці фіз. уласцівасцей С. паблізу ад фазавых пераходаў, распрацаваны метады вырошчвання новых крышталічных С. і вывучаны залежнасці іх уласцівасцей ад умоў вырошчвання і інш.

Літ.: Лайнс М., Гласс А. Сегнетоэлектрики и родственные им материалы: Пер. с англ. М., 1981.

П.А.Пупкевіч.

СЕГНЕТАЭЛЕКТРЫ́ЧНАСЦЬ, фераэлектрычнасць, сукупнасць электрычных і інш. уласцівасцей, характэрных для *сегнетаэлектрыкаў*, раздзел фізікі цвёрдага цела, які вывучае такія ўласцівасці. Сегнетаэл. ўласцівасці ўстаноўлены ў 1921 чэш. вучоным І.Валашкам у крышталях сегнетавай солі (адсюль назва).

Арыентацыя многіх элементарных эл. дыпольных момантаў у сегнетаэлектрыку ў адным напрамку вядзе да ўзнікнення самаадвольна палярызаваных абласцей (*даменаў*), што абумоўлівае спецыфічныя фіз. ўласцівасці сегнетаэлектрыкаў: вял. значэнне дыэл. пранікальнасці, залежнае ад напружанасці эл. поля і т-ры, анамаліі цеплаёмістасці, п'езаэл. і інш. уласцівасцей, асабліва прыкметныя ў вобласці фазавага пераходу. Наяўнасць даменнай структуры вядзе да поўнай кампенсацыі макраскапічнай палярызацыі (адсутнічае «уніпалярнасць»). Раўнаважная даменная структура адпавядае мінімуму свабоднай энергіі крышталя. У ідэальных крышталях яна вызначаецца балансам паміж змяншэннем электрастатычнай энергіі пры ўтварэнні даменаў і энергіяй узнікшых даменных сценак; у рэальных крышталях — акрамя таго, прыродай і размеркаваннем дэфектаў, а таксама перадгісторыяй узору. Паводле характару палярызацыі ячэек у даменах адрозніваюць сегнета-, антысегнета- і сегнетыэлектрыкі: у сегнетаэлектрыках усе ячэйкі маюць аднолькавы напрамак палярызацыі, у антысегнетаэлектрыках дамены складаюцца з антыпаралельна палярызаваных ячэек, якія маюць роўныя па модулі эл. моманты; у сегнетыэлектрыках эл. моманты элементарных ячэек скампенсаваны не поўнасцю і гэтыя матэрыялы маюць сегнета- і антысегнетаэлектрычныя ўласцівасці. Усе сегнетаэлектрыкі з'яўляюцца таксама піра- і п'езаэлектрыкамі. Каля *Кюры пункта* з-за адчувальнасці атамнай структуры крышталю да знешніх уздзеянняў многія яго ўласцівасці (дыэл., п'езаэл., электрааптычныя, пругкія і інш.) нелінейныя і экстрэмальныя. Акрамя таго дынаміка даменнай структуры істотная для анізатропных уласцівасцей крышталю ў сегнетафазе і таксама вядзе да іх нелінейнасці і ўзрастання. Такія крышталі выкарыстоўваюцца ў радыё-, оптa-, акустаэлектроніцы і вымяральнай тэхніцы.

На Беларусі даследаванні па С. вядуцца ў Ін-це фізікі Нац. АН, БДУ, Бел. пед. ун-це, Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі і інш.

Літ.: Сонин А.С., Струков Б.А. Введение в сегнетоэлектричество. М., 1970; Струков Б.А., Леванюк А.П. Физические основы сегнетоэлектрических явлений в кристаллах. 2 изд. М., 1995; Физика сегнетоэлектрических явлений. Л., 1985.

П.А.Пупкевіч.

СЕГНЕТАЭЛЕКТРЫ́ЧНЫ ГІСТЭРЭ́ЗІС, спецыфічная залежнасць эл. палярызаванасці *сегнетаэлектрыка* ад напружанасці знешняга эл. поля.



Пятля **сегнетаэлектрычнага гістэрэзіса**: P — палярызацыя ўзору; P_s — палярызацыя насычэння; P_R — астаткавая палярызацыя; E_c — напружанасць каэрцытыўнага поля.

Пры ўключэнні эл. поля ўзнікае *палярызаванасць*, якая спачатку рэзка нарастае і дасягае насычэння. Пры змяншэнні напружанасці поля палярызаванасць адстае ад змены напружанасці і пры выключэнні поля набывае рэштkавае значэнне. Для памяншэння палярызаванасці да нуля неабходна прыкласці поле процілеглага напрамку (каэрцытыўнае поле). Пры далейшым павелічэнні адваротнага поля таксама дасягаецца насычэнне. Атрыманы графік залежнасці наз. пятлёй *гістэрэзіса*. У полідаменных крышталях форма пятлі больш плаўная, у монадаменных — блізкая да прамавугольнай. Форма пятлі С.г. залежыць таксама ад т-ры; пры т-рах, якія перавышаюць *Кюры пункт*, дзе сегнетаэлектрык страчвае свае спецыфічныя ўласцівасці, пятля пераўтвараецца ў прамую.

СЕГО́ВІЯ (Segovia) Андрэс (21.2.1893, г. Лінарэс, Іспанія — 2.6.1987), іспанскі гітарыст-віртуоз, педагог. Вучыўся ігры на гітары самастойна. З 1955 працаваў у Акадэміі Кіджана ў Італіі, з 1958 — у Сант'яга-дэ-Кампастэла ў Іспаніі. Адрадзіў цікавасць да гітары як да сольнага інструмента, пашырыў яе тэхн. і выразныя магчымасці, увёў у рэпертуар гітарыстаў класічную і сучасную музыку. Аўтар канцэрта для гітары з арк., п'ес

«Танадзілью», «Арасьён» і інш. Узбагаціў рэпертуар гітарыстаў апрацоўкамі твораў І.С.Баха, І.Гайдна, Л.Бетховена, П.Чайкоўскага, М.Мусаргскага і інш. У іх выявілася тонкае пачуццё стылю, майстэрскае выкарыстанне поліфанічнай і каларыстычнай магчымасцей інструмента. Яго мастацтва натхніла многіх кампазітараў на стварэнне твораў для гітары, некат. напісаны для С. і прысвечаны яму. Гастраліраваў у многіх краінах, у т.л. ў СССР у 1926, 1927, 1936.

Э.Дж.Сегрэ.

СЕГРЭ́ (Segrè) Эміліо Джына (1.2.1905, г. Тывалі, Італія — 22.4.1989), амерыканскі фізік-эксперыментатар. Чл. Нац. АН ЗША (1952), Нац. акадэміі дэі Лінчэі (1958), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1973). Скончыў Рымскі ун-т (1928), дзе працаваў з 1929. З 1936 ва ун-це ў г. Палерма. З 1938 у ЗША. У 1938—72 у Каліфарнійскім ун-це ў г. Берклі (з 1946 праф.). У 1943—46 удзельнічаў у стварэнні атамнай бомбы ў ЗША. Навук. працы па атамнай спектраскапіі, ядз. фізіцы, радыяхіміі, штучнай радыеактыўнасці, фізіцы элементарных часціц. Эксперыментальна рэалізаваў запавольванне нейтронаў і адкрыў *павольныя нейтроны* (1934; разам з Э.*Фермі* і інш.). Адкрыў (разам з інш.) першы штучны элемент тэхнецый (1937), астат (1940) і ізатоп плутонію ^{239}Pu (1941), а таксама антыпратон (1955). Нобелеўская прэмія (разам з О.*Чэмберленам*).

Тв.: A mind always in motion: The autobiography of Emilio Segre. Berkeley, 1993; Рус. пер. — Антипротоны. М., 1957; Экспериментальная ядерная физика. Т. 3. М., 1961 (у сааўт.); Энрико Ферми — физик. М., 1973.

М.М.Касцюковіч.

СЕГРЭГА́ЦЫЯ (ад позналац. segregatio аддзяленне), палітыка прымусовага аддзялення груп насельніцтва па расавых або этнічных прыкметах; адна з форм расавай *дыскрымінацыі*. Існавала ў шэрагу краін (ЗША, Паўд.-Афр. Рэспубліцы, Аўстраліі і інш.) да 2-й пал. 20 ст. ў адносінах да «каляровага» нас. (эмігрантаў, карэнных жыхароў і інш.). Практыкавалася забарона жыць у адных раёнах горада з «белым» насельніцтвам, наведваць прызначаныя для «белых» школы, тэатры, бальніцы, гасцініцы і г.д., карыстацца адным транспартам. У наш час С. спынена як палітыка, што супярэчыць прынцыпам і нормам *міжнароднага права*, Статуту ААН, Міжнар. канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх форм расавай дыскрымінацыі, Міжнар. пактам аб правах чалавека, Міжнар. канвенцыі аб спыненні *апартэіду* і інш.

СЕГРЭГА́ЦЫЯ, 1) у металургіі — неаднароднасць хім. саставу сплаваў, якая ўзнікае ў працэсе іх крышталізацыі (у гэтым выпадку яе наз. *ліквацыяй*) або тэрмічнай апрацоўкі ў цвёрдым стане. 2) С. ў горнай справе — неаднароднае размеркаванне зерняў розных памераў у слоі мінер. сумесі, якое ўзнікае пад дзеяннем гравітацыйных сіл і вібрацыі (дробныя зерні трапляюць у ніжнюю частку пасеянага слоя).

СЕГУ́ (Ségou), горад у Малі, на правым беразе р. Нігер. Адм. ц. вобласці. Каля 100 тыс. ж. (2001). Рачны порт, вузел аўтадарог. Аэрапорт. Гандл. ц. с.-г. раёна (рыс, арахіс, цукр. трыснёг, манга, жывёлагадоўля). Прам-сць: бавоўнаачышчальная, цагельная, тэкстыльная. Саматужна-рамесніцкія прадпрыемствы (вытв-сць шарсцяных дываноў і коўдраў з нац. арнаментам).

СЕДА́Н (Sedan), горад на ПнУ Францыі, на р. Мёз. Каля 50 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Металургічная прам-сць, вытв-сць шарсцяных тканін і дываноў.

У 14 ст. царкоўнае ўладанне. З канца 14 ст. ў складзе Францыі. У 15—17 ст. буйны цэнтр вытворчасці сукна. У час рэліг. войнаў на баку *гугенотаў*. У 1592 тут засн. кальвінісцкая тэалагічная акадэмія. У *франка-прускую вайну 1870—71* каля С. герм. войскамі ген.-фельдмаршала Г.К.Б.Мольтке 1.9.1870 разгромлена франц. армія маршала М.Э.Мак-Магона; узята ў палон больш за 100 тыс. чал., у т.л. імператар *Напалеон III*.

СЕДА́Н (мяркуюць, ад назвы франц. г. Седан), закрыты кузаў легкавога аўтамабіля. Мае 4 дзвярэй, 2 ці 3 рады сядзенняў.

СЕ́ДАН (Seddon) Маргарэт (н. 8.11.1947, Мафрысбара, ЗША), касманаўт ЗША. Д-р медыцыны (1973). Скончыла ун-т у г. Берклі. У 1978—98 у атрадзе касманаўтаў НАСА. Здзейсніла палёты ў складзе экіпажаў касм. караблёў (КК): 12—19.4.1985 — на КК «Дыскаверы», 5—14.6.1991 і 18.10—1.11.1993 — на КК «Калумбія». У космасе правяла 30,1 сут.

У.С.Ларыёнаў.

СЕДАТЫЎНЫЯ СРО́ДКІ, лекавыя сродкі, якія маюць заспакаяльны ўплыў. Адрозніваюць С.с. расл. паходжання (прэпараты валяр'яны, сардэчніку, півоні, пасіфлоры), сінт. (прэпараты брому, напр., натрыю і калію брамід) і камбінаваныя (валакардзін, валаседан і інш.). Заспакаяльным дзеяннем у малых дозах валодаюць *снатворныя сродкі*, *транквілізатары*, *сардэчныя гліказіды*, нейралептыкі і інш. Зніжэнне эмацыянальнага напружання, часам лёгкі снатворны эфект пры прыёме С.с. абумоўлены ўзмацненнем працэсаў тармажэння або аслабленнем працэсаў узбуджэння ў ц.н.с. С.с. ўзмацняюць уздзеянне снатворных, абязбольваючых і інш. сродкаў, не выклікаюць прывыкання, псіхічнай і фіз. залежнасці, расстройстваў каардынацыі руху. Ужываюцца для лячэння неўрозаў, пры бяссонніцы, павышанай раздражняльнасці, спазмах страўнікава-кішачнага тракта, пач. стадыі артэрыяльнай гіпертаніі.

І.М.Семяненя.

СЕДЛАВІ́НА, 1) паніжэнне паміж вяршынямі горнага хрыбта тэктанічнага або эразійна-дэнудацыйнага паходжання. Часта С. выкарыстоўваюцца як перавальныя шляхі (гл. *Перавал*). 2) Прастора ў барычным полі паміж дзвюх абласцей высокага і дзвюх абласцей нізкага ціску, размешчаных крыж-накрыж (барычная С.).

СЕДЛАВЫ́ КА́МЕНЬ З Я́МКАМІ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1997). Размешчаны за 100 м на ПдУ ад в. Занарач Мядзельскага р-на Мінскай вобл., каля шашы Брусы—Нарач. Ружова-шэры дробназярністы граніт з крышталямі палявога шпату. Даўж. 4 м, шыр. 3,2 м, выш. 1 м, у абводзе 11,5 м, аб'ём бачнай часткі 13 м^3, маса 30 т. Прынесены ледавіком каля 20—15 тыс. г. назад са Скандынавіі. На верхняй пляцоўцы захаваліся 8 штучных паўсферычных паглыбленняў з адшліфаванымі сценкамі дыяметрам 3—4 см, глыб. 1,5—2 см, якія зроблены чалавекам каля 2—2,5 тыс. гадоў назад. У старажытнасці меў культавае значэнне.

В.Ф.Вінакураў.

Седлавы цягач «Кенварт» (ЗША) са спальным адсекам.

СЕДЛАВЫ́ ЦЯГА́Ч, аўтамабіль без грузавой платформы (*цягач*), абсталяваны апорна-счапным прыстасаваннем (сядлом) для злучэння з рамай паўпрычэпаў. Мае павышаную магутнасць рухавіка, большыя перадатачныя адносіны ў сілавой перадачы, укарочаную базу. Выкарыстоўваюцца ў складзе *аўтапаязда*ў, у т.л. самазвальных. На Беларусі С.ц. выпускае *Мінскі аўтамабільны завод* (першы МАЗ-200В выпускаўся з 1952, мадэрнізаваныя 2- і 3-восевыя — з 1970-х г., 3-восевыя з сям'і МАЗ-6422 — з 1981). Мільённым аўтамабілем, выпушчаным з-дам у 1989, быў С.ц. МАЗ-64221. Гл. таксама *МАЗ*.

СЕ́ДЛАЧАК (Sedláček) Войцех (9.9.1892, Лібчані, Чэхія — 3.2.1973), чэшскі жы-

вапісец і графік. Вучыўся ў Пражскай АМ (1911—20). Зазнаў уплывы А.Славічака і *Я.Прэйслера*. Чл. аб'яднанняў «Умелецкая бяседа» (1913), «Галар» (1919). Творчасці характэрны арыентацыя на рэаліст. традыцыі нац. мастацтва, лірыка-эпічная манера выканання. Аўтар жывапісных кампазіцый «Валацуга» (1924), «Збор бульбы» (1934), «У вёсцы» (1941), «Восень на палях» (1952), «Восень на загуменні» (1954), графічных работ «Цыганка» (1916), «Садоўніца» (1920), «Праца ў полі» (1971). Афармій кнігі Я.Гербена, братоў Мрштыкаў.

Літ.: Современное чешское и словацкое искусство. Л., 1989. *Я.Ф.Шунейка.*

СЕ́ДЛЬЦЫ (Siedlce), горад на У Польшчы у Мазавецкім ваяводстве. Каля 90 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: маш.-буд., металаапр., трыкат., харчовая. Арх. помнікі 18—19 ст.

СЕ́ДУМ, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Расходнік*.

СЕДЫМЕНТАЦЫ́ЙНЫ АНА́ЛІЗ, сукупнасць метадаў вызначэння памераў часцінак у дысперсных сістэмах і малекулярных мас макрамалекул па скорасці *седыментацыі*. Для грубадысперсных сістэм выкарыстоўваюць седыментацыю ў полі гравітацыйных сіл, для высокадысперсных сістэм праводзяць С.а. з дапамогай цэнтрыфуг і ультрацэнтрыфуг. Вызначаюць канстанту седыментацыі (адносіны скорасці седыментацыі да паскарэння поля цэнтрабежных сіл), якая залежыць ад масы і формы часцінак ці малекулярнай масы макрамалекул. С.а. праводзяць з мэтай вызначэння дысперснага саставу здробненых матэрыялаў, глеб, грунтоў. У біяхіміі і малекулярнай біялогіі дазваляе ўстанавіць састаў і памеры клетачных структур, вірусаў і інш.

СЕДЫМЕНТА́ЦЫЯ (ад лац. sedimentum асяданне), асяданне часцінак дысперснай фазы (цвёрдых крупінак, кропелек вадкасці, пузыркоў газу) у вадкім ці газападобным дысперсным асяроддзі ў гравітацыйным полі ці ў полі цэнтрабежных сіл. Адбываецца пры перавазе накіраванага руху часціц (пад уздзеяннем сілы цяжару ці цэнтрабежных сіл) над хаатычным цеплавым рухам (гл. *Броўнаўскі рух*, *Дыфузія*).

Часцінкі грубадысперсных сістэм седыментуюць у полі гравітацыйных сіл, С. каларідных часцінак і макрамалекул магчыма ў полі цэнтрабежных сіл (гл. *Цэнтрыфугаванне*). Скорасць С. залежыць ад масы, памераў і формы часцінак, вязкасці і шчыльнасці асяроддзя, а таксама ад паскарэння, што ўзнікае пры ўздзеянні на іх сіл поля. У прыродзе ў выніку С. адбываюцца *асадканамнажэнне* ў водных басейнах, адстойванне мутнай вады, ачышчэнне паветра ад пылавых і кропельнавадкіх часцінак. У прам-сці С. выкарыстоўваецца пры абагачэнні карысных выкапняў, раздзяленні прадуктаў хім. і нафтахім. тэхналогій, водаачыстцы і інш. С. ў цэнтрыфугах — аснова *седыментацыйнага аналізу*.

СЕЗА́М, род кветкавых раслін, тое, што *кунжут*.

СЕЗА́МАВЫ АЛЕ́Й, тое, што *кунжутны алей*.

СЕЗА́Н (Cézanne) Поль (19.1.1839, г. Экс-ан-Праванс, Францыя — 22.10.1906), французскі жывапісец, вядучы прадстаўнік *постімпрэсіянізму*. Вучыўся ў Муніцыпальнай школе малявання у Экс-ан-Правансе (1858—60) і прыватнай акадэміі Сюіса ў Парыжы (1861—65). Раннім яго творам уласцівы экспрэсіўна-фантасмагарычны характар, уплывы П.Веранезе, Я.Тынтарэта, Э.Дэлакруа і А.Дам'е («Негр Сцыпіён», 1865; «Оргія», 1864—68; «Растае снег. Эстак», 1870). У 1870-я г. звярнуўся да імпрэсіянізму; жывапісная тэхніка набыла характар дробных плаўных мазкоў, вял. значэнне ў творах пачалі мець суразмернасць аб'ёмаў і тонаў, у партрэтах — псіхааналіз: «Дом павешанага» (1873), «Нацюрморт з вазай і садавінай» (каля 1877), «Мадам Сезан у чырвоным крэсле» (1877). У 1880-я г. творчасць С. дасягнула росквіту. У адрозненне ад імпрэсіяністаў яго найб. цікавілі не дынаміка святлопаветранага асяроддзя і змяненне колеру ў атмасферы, а ўстойлівыя заканамернасці колеравых спалучэнняў і форм, матэрыяльнасць прадметнага і прыроднага асяроддзяў. Ён доўга распрацоўваў адзін і той жа матыў у пошуках структурнай канструктыўнасці прыродных форм (шматлікія выявы гары Сент-Віктуар, 1885—1900). Выкарыстоўваў пераважна

П.Сезан. Вялікія купальшчыцы. 1898—1905.

градацыі трох асн. колераў (зялёнага, блакітнага і жоўтага). Спалучэннем тонкіх і празрыстых фарбаў з кантрастнымі, нанесенымі шчыльнымі корпуснымі мазкамі, ствараў прасторавыя планы і ступень асвятлення. Раўнавагу фарбавай фактуры гарманічна спалучаў са смелым лаканічным малюнкам, канструктыўна-дакладнай, пластычна-абагульненай лепкай формы і ўраўнаважанасцю кампазіцыі (аўтапартрэт, 1879—85; «П'еро і Арлекін», 1888; «Персікі і грушы», 1888—90; «Вялікія купальшчыцы», 1898—1905). Для яго пейзажаў характэрны панарамны ахоп напоўненага святлом ландшафту («Дарога», 1883—87; «Берагі Марны», 1888; «Мост у Труа-Сатэ», 1906). У нацюрмортах з дапамогай фарбавай фактуры і выкарыстання чыстага колеру выяўляў матэрыяльную структуру і строгую пластычнасць прадметнага свету («Нацюрморт з драпіроўкай», 1898—99, і інш.).

Літ.: Воллар А. Ренуар. Сезанн: Пер. с фр. СПб., 2000; Перрюшо А. Сезанн: Пер. с фр. М., 1966; Поль Сезанн: Переписка, воспоминания современников: [Пер. с фр.]. М., 1972; Поль Сезанн: [Альбом]. Л., 1975. *С.У.Пешын.*

СЕЗО́Н (франц. saison ад лац. satio сяўба, час сяўбы), 1) пара года, якая вылучаецца па астр., кліматычных, феналагічных прыкметах, працягласцю звычайна ў некалькі месяцаў (гл. *Кліматычныя сезоны*, *Вясна*, *Лета*, *Восень*, *Зіма*). 2) Частка года, якая характарызуецца якімі-н. з'явамі прыроды (С. дажджоў) або пастаянна выкарыстоўваецца для якой-н. дзейнасці, пэўных работ (С. тэатральны, С. уборкі ўраджаю), заняткаў або адпачынку (С. палявання, курортны С.).

СЕЗО́ННАСЦЬ ВЫТВО́РЧАСЦІ, нераўнамернасць выпуску прадукцыі, якая залежыць ад пары года, біял. фактараў (перыяд выспявання раслін), выканання асобных работ (паляўнічы сезон, рыбалоўства) і інш. Уплывае на работу с.-г. прадпрыемстваў, што перапрацоўваюць с.-г. сыравіну, гандлю, транспарту, буд. арг-цый, здабычу карысных выкапняў адкрытым спосабам, паніжае рытмічнасць вытв-сці, узровень

выкарыстання вытв. магутнасцей, прац. рэсурсаў, запавольвае грашовае абарачэнне.

СЕЗО́ННЫЯ РАБО́ТНІКІ, асобы, занятыя на работах на працягу пэўнага перыяду (сезона). Звязаны з сезонным характарам вытв-сці ў сельскай гаспадарцы, лясной, рыбнай, некат. галінах харч. прам-сці, у буд-ве і інш. Працоўныя адносіны С.р. устанаўліваюцца мясц. органамі, некат. нормы — дзярж. заканадаўствам.

СЕЗО́ННЫЯ ЦЭ́НЫ, цэны, якія мяняюцца ў залежнасці ад пары года (на с.-г. прадукцыю) або сезона (на адзенне, абутак); гл. таксама *Цэнаўтварэнне*.

СЕ́ІД, амір, мір, сабзпуш, хабіб, ганаровы тытул мусульман, якія лічацца нашчадкамі *Мухамеда* і паходзяць ад унука прарока *Хусейна*. У дамусульманскай Аравіі С. наз. правадыроў плямён і прадстаўнікоў знаці.

СЕІДЗІ́ Сеітназар Хабіп-хаджа аглы (1775, с. Лама Чарджоўскай вобл., Туркменістан — 1836), туркменскі паэт, палкаводзец. Вучыўся ў медрэсэ. Дэбютаваў пераймальнымі дыдактычнымі вершамі. Вядомасць прынесла любоўная лірыка: «Салтан Хадзіджа», «Білмез» і інш. У яго творчасці набыла развіццё патрыят. тэма («Пакінем радзіму», «Бывайце, берагі Амудар'і», «Разлука» і інш.). Паэт. перапіска з паэтам-палкаводцам К.Зелілі паклала пачатак новай эпісталярнай паэзіі. Загінуў у баі з персамі.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1976; У кн.: Сеиди. Зелили. Стихотворения. Л., 1984.

СЕІ́ТАЎ Сагінгалі (н. 20.11.1917, Акжаікскі р-н Уральскай вобл., Казахстан), казахскі паэт, літаратуразнавец. Канд. філал. н. (1961). Скончыў Алма-Аціпскі пед. ін-т (1941). Удзельнік вызвалення Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Працуе ў Ін-це л-ры і мастацтва АН Казахстана (з 1961). Друкуецца з 1930-х г. Аўтар паэт. зб-каў «Ад сэрца да сэрца» (1953), «Да вышынь» (1963), «Рэха» (1967), «Я заўсёды з вамі» (1968) і інш. Даследуе каз.-бел. літ. ўзаемасувязі, творчасць Я.Купалы, Я.Коласа, М.Танка і інш.: арт. «Янка Купала» (1954), «Літаратура беларускага народа» (1955), «Вузы трывалых сувязей» (1965), «Голас народнага трыбуна», «Прачытай і перадай другому» (1982). Беларусі прысвяціў вершы «Балада пра Пінскія балоты», «Магілёў», «Мінск узяты», «Школа», «Канстанцін Заслонаў», «Брэст» і інш., апавяд. і нарысы «Вочы эскадрона», «Паядынак». На каз. мову пераклаў вершы Я.Купалы, М.Танка. На бел. мову яго вершы пераклалі Р.Барадулін, У.Корбан, В.Рагойша.

Тв.: Рус. пер. — Капли на тополях. Алма-Ата, 1961; Сокровенное. Алма-Ата, 1981.

Літ.: Рагойша В. Дыялогі з палымянай памяццю // Маладосць, 1976. № 2.

В.П.Рагойша.

СЕЙ, Сэй (Say) Жан Батыст (5.1.1767, г. Ліён, Францыя — 15.11.1832), французскі вучоны-эканаміст. Ганаровы чл. Пецярбургскай АН (1816). Праф. паліт. эканомікі (з 1819). Упершыню сістэматызаваў курс эканам. навукі. Яго навук. працы наз. «палітычнай эканоміяй цвярозага розуму». Прыхільнік свабоднага гандлю і неўмяшання дзяржавы ў эканам. жыццё, сфармуляваў т.зв. закон рынку. Лічыў, што абмен тавараў аўтаматычна прыводзіць да раўнавагі паміж купляй і продажам. Яго тэорыя збыту ўвайшла ў навуку пад назвай «закон С.». Адзін з аўтараў тэорыі фактараў вытв-сці, паводле якой працы, капіталу, зямлі адпавядаюць зарплата, прыбытак і рэнта. Як і Т.Р.Мальтус, тлумачыў прычыну беднасці празмернасцю насельніцтва ў параўнанні са сродкамі існавання.

Тв.: Рус. пер. — Трактат по политической экономии. М., 2000.

СЕ́ЙБРАНДС (Sijbrands) Тон (н. 15.12.1949, Нідэрланды), нідэрландскі спартсмен (стаклетачныя шашкі). Міжнар. гросмайстар (1963). Чэмпіён свету (1972, 1973, у складзе каманды 1978), Еўропы (1967, 1968, 1969, 1971). Распрацаваў тэорыю «тэмпаў» у шашачнай стратэгіі. Аўтар кніг па шашках. *П.А.Шацаў.*

СЕЙВА́Л, сайдавы кіт (Balaenoptera borealis), млекакормячае сям. паласацікавых падатр. бяззубых кітоў. Пашыраны ў морах ад Арктыкі да Антарктыкі.

Даўж. цела дарослых самцоў да 18,8 м, самак да 21 м, маса да 16 т, даўж. нованароджанага 4—5 м. Афарбоўка спіны ад сіняватачорнай да чорна-шараватай, бруха — ад шэрай да белай. Паднябенне вузкае, белае ці ружовае; па яго баках 300—400 чорных пласцін кітовага вуса выш. да 80 см. Корміцца ракападобнымі, галаваногімі малюскамі, чародным рыбамі, напр. сайдай (адсюль другая назва). Нараджае 1 дзіцяня раз у 2 гады. Промысел забаронены з 1980.

Сейвал.

СЕ́ЙЛАВІЦКІ БОЙ 1943, бой партызанскага атрада імя Шчорса (камандзір А.І.Колчанка) па разгроме фаш. гарнізона (каля 100 гітлераўцаў) у в. Сейлавічы Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. 7—8 вер. ў Вял. Айч. вайну. Гарнізон, умацаваны сістэмай дзотаў, бункераў, лініямі траншэй з калючым дротам, замініраванымі ўчасткамі абароны, перашкаджаў перадыслакацыі і баявым рэйдам партыз. фарміраванняў у зах. ч. Беларусі. Скарыстаўшы сітуацыю, калі 60 гітлераўцаў гарнізона накіраваліся ў г.п. Гарадзея, партызаны (350 чал.) скрытна падышлі да гарнізона, атакавалі і разгромілі яго. Адышлі без страт з захопленай нам. зброяй і боепрыпасамі.

СЕ́ЙЛАВІЧЫ, вёска ў Нясвіжскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Нясвіж—Бузуны. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на ПнУ ад г. Нясвіж, 114 км ад Мінска, 17 км ад чыг. ст. Гарадзея. 795 ж., 525 двароў (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Касцёл Сэрца Ісуса. Магіла ахвяр фашызму. У Вял. Айч. вайну ў вёсцы адбыўся *Сейлавіцкі бой 1943*.

СЕЙМ (польск. sejm, літ. saimas, чэш. sněm), 1) саслоўна-прадстаўнічая ўстанова ў саслоўных манархіях Польшчы, Вялікім княстве Літоўскім і ў іх аб'яднанай дзяржаве — Рэчы Паспалітай (гл. *Сойм*), у Чэхіі ў 13 — пач. 20 ст. 2) Рус. назва парламента ў Вял. княстве Фінляндскім, якое ў 1809—1917 уваходзіла на правах аўтаноміі ў склад Рас. імперыі. 3) Аднапалатныя парламенты ў Літве ў 1922—40 і з 1992 (паводле канстытуцый 1922 і 1992), Латвіі ў 1922—34 і з 1993 (паводле канстытуцыі 1922, адноўленай у 1993); ніжэйшая палата парламента Польшчы ў 1921—39 і з 1989. 4) Вышэйшы орган дзярж. улады і адзіны заканад. орган у Польшчы ў 1947—88.

СЕ́ЙМІК, сход шляхты павета або ваяводства ў феад. Польшчы і ВКЛ, гл. *Соймік*.

СЕ́ЙМІНСКІ МО́ГІЛЬНІК, могільнік бронзавага веку (сярэдзіна 2-га тыс. да н.э.) каля ст. Сейма (паблізу г. Ніжні Ноўгарад, Расія), на пясчанай дзюне левага берага р. Ака. Выяўлены ў 1912. Налічваў каля 50 неглыбокіх магіл, у кожнай з якіх знаходзіўся шкілет з багатым пахавальным інвентаром (бронзавыя масіўныя бранзалеты, кінжалы, наканечнікі коп'яў, сякеры-кельты, плоскія паліраваныя кольцы з нефрыту, рэшткі ўпрыгожанняў з бурштыну, шматлікія крамянёвыя стрэлы дасканалай апрацоўкі і інш.). Знаходкі сведчаць пра ўсх., заўральскае паходжанне С.м.

СЕ́ЙНЕР (англ. seiner ад seine кашальковы невад), судна для лоўлі рыбы кашальковым *невадам*. Мае рабочыя (сейнерныя) пляцоўкі для кашалькавання, закідвання і выбаркі невада. Асн. прамысл. механізмы: сейнерная ці тралавая лябёдка і прамысл. страла з сілавым блокам; маторная лодка для дапаможных аперацый пры закідванні невада. Найб. буйныя С. маюць верталёт для пошуку рыбы. Прыстасаваныя таксама для работы з тралам, дрыфтэрнымі сеткамі і інш.

СЕЙСМАГРА́МА (ад грэч. seismos ваганне, землетрасенне + ... *грама*), бесперапынны запіс сейсмічных ваганняў з дапамогай *сейсмографа*. Найб. пашыра-

на тэхніка запісу на фотапаперы светлавым промнем, таксама выконваецца на закуранай паперы вастрыём пяра, на паперы пяром з чарнілам і інш. У *сейсмалогіі* па С. вызначаюць момант набліжэння сейсмічных хваль, вуглы іх выхаду на зямную паверхню, амплітуды і перыяды розных тыпаў хваль, што дазваляе вызначыць каардынаты і інтэнсіўнасць землетрасенняў, вывучаць унутр. будову Зямлі. У *сейсмічнай разведцы* па С. вызначаюць сумарны час распаўсюджвання сейсмічных ваганняў (ад месца іх узбуджэння да адбівальнай ці пераламляльнай мяжы і назад да месца іх рэгістрацыі), форму запісу ваганняў, іх амплітуды, паводле інтэрпрэтацыі якіх вызначаюць глыбіню залягання, характар геал. межаў і некат. параметры горных парод. *В.Я.Ключ.*

СЕЙСМАЛО́ГІЯ (ад грэч. seismos ваганне, землетрасенне + ... *логія*), раздзел *геафізікі*, які вывучае землетрасенні, будову глыбінных нетраў Зямлі. Падзяляецца на ўласна С., *сейсмаметрыю* і прыкладную С. Уласна С. аналізуе геагр. пашырэнне ачагоў землетрасення і сейсмаактыўных зон, выяўляе іх сувязі з унутрызямнымі працэсамі, вывучае ўнутр. будову Зямлі і вызначае межы падзелу яе «цвёрдых» абалонак (гл. *Зямная кара*, *Мантыя* і інш.), займаецца *сейсмічным раянаваннем*. Сейсмаметрыя распрацоўвае метады вывучэння пругкіх ваганняў слаёў Зямлі, выкліканых прыроднымі ці штучнымі сейсмічнымі з'явамі. Прыкладная С. займаецца пытаннямі сейсматрывалага буд-ва, прагназуе землетрасенні. Як навука сфарміравалася ў сярэдзіне 19 ст. з развіццём яе тэарэт., метадычнай і інструментальнай частак. Вял. ўклад у С. зрабілі вучоныя: рус. Б.Б.Галіцын, ням. Э.Віхерт і Б.Гутэнберг, англ. Дж.Мілн і інш. На Беларусі сейсмалаг. даследаванні пачаліся з 1965 на сейсмічнай станцыі «Мінск» у *Плешчаніцкай геафізічнай абсерваторыі*. У 1979 у Ін-це геал. навук Нац. АН Беларусі створана Доследна-метадычная партыя, якая выконвае комплекс сейсмалагічных даследаванняў. Сейсмаметрычныя назіранні вядуцца на стацыянарных («Мінск», «Гомель», «Нарач», «Салігорск») і перасоўных сейсмічных станцыях. *В.Я.Ключ.*

СЕЙСМАМЕТРЫ́Я (ад грэч. seismos ваганне, землетрасенне + ... *метрыя*), раздзел *сейсмалогіі*, які распрацоўвае метады і прыборы рэгістрацыі ваганняў грунтоў, збудаванняў і інш. аб'ектаў пры ўздзеянні на іх сейсмічных хваль, выкліканых прыроднымі ці штучнымі сейсмічнымі з'явамі. Запіс сейсмічных ваганняў робіцца з дапамогай *сейсмографаў* у выглядзе *сейсмаграмы*. Рэгістрацыя сейсмічных хваль, што ўзнікаюць пры землетрасеннях, ядзерных выбухах і інш. вядзецца на *сейсмічных станцыях*. *В.Я.Ключ.*

СЕЙСМАЎСТО́ЙЛІВАЕ БУДАЎНІЦТВА, антысейсмічнае будаўніцтва, узвядзенне будынкаў і збудаванняў, здольных процістаяць сейсмічным уздзеянням пры *землетрасеннях*, захоўваючы свае эксплуатацыйныя якасці. Па 12-бальнай шкале сейсмічна небяспечным для будынкаў і збудаванняў лічыцца землетрасенне інтэнсіўнасцю 6 балаў, на ўчастках з сейсмічнасцю больш за 9 балаў буд-ва, як правіла, не дапускаецца.

Сейсмаўстойлівасць збудаванняў забяспечваецца выбарам спрыяльнага ў сейсмічных адносінах месца (пляцоўкі) для буд-ва (для гэтага карыстаюцца спец. *сейсмічнымі картамі*), распрацоўкай найб. рацыянальных канструктыўных і планіровачных схем збудаванняў, выкарыстаннем адпаведных матэрыялаў і буд. канструкцый. Сейсмічныя нагрузкі на збудаванні вызначаюцца залежна ад сейсмічнасці раёна буд-ва, характару і інтэнсіўнасці руху грунту пры землетрасенні, канструкцыйных асаблівасцей збудавання (памераў у плане, працягласці, вышыні, паверхавасці і інш.).

СЕЙСМІ́ЧНАЕ РАЯНАВА́ННЕ, падзел тэрыторыі на раёны рознай сейсмічнай актыўнасці; ацэнка і карціраванне патэнцыяльнай сейсмічнай небяспекі. Даныя С.р. выкарыстоўваюцца пры сейсмастойкім буд-ве, прагнозе землетрасенняў і вырашэнні інш. задач на сейсмічна небяспечных тэрыторыях. Засн. на базе комплекснага аналізу гіст. звестак пра землетрасенні, сучаснай сейсмічнай актыўнасці, геолага-тэктанічнай будовы тэрыторыі і геафіз. даных. На картах С.р. вылучаюць зоны розных глыбінь узнікнення магчымых ачагоў землетрасення (найб. небяспечныя землетрасенні з ачагамі на глыб. 3—50 км), з макс. магнітудамі землетрасенняў ($M_{max} \geq 8{,}1$; $8 > M \geq 7{,}1$; $7 > M \geq 6{,}1$), з інтэнсіўнасцю 9, 8, 7, 6, 5 і менш балаў. Маштабы карт ад 1:5 000 000 да 1:100 000. Праводзіцца таксама сейсмічнае мікрараянаванне для гарадоў і асобных пунктаў буд-ва. На Беларусі ў Ін-це геал. навук Нац. АН Беларусі складзена схема сейсматэктанічнага раянавання, дзе вылучаны зоны магчымых землетрасенняў інтэнсіўнасцю больш за 5 балаў (маштаб 1:1 000 000; аўтары Р.Г.Гарэцкі, А.М.Бабарыкін, В.М.Бурак і інш.). *В.Я.Ключ.*

СЕЙСМІ́ЧНАСЦЬ ЗЯМЛІ́, схільнасць Зямлі або асобных яе тэрыторый да *землетрасенняў*. Характарызуецца інтэнсіўнасцю землетрасенняў, тэрытарыяльным размеркаваннем іх эпіцэнтраў і інш. Найб. сейсмічныя Ціхаакіянскі, Міжземнаморскі, Сярэдзінна-Атлантычны, Усходнеафрыканскі паясы (гл. адпаведныя арт. і карту). Паводле сукупнасці даных аб С.з. праводзіцца *сейсмічнае раянаванне* тэр., ствараюцца *сейсмічныя карты*. Вывучае *сейсмалогія*. Гл. таксама *Сейсмічная разведка*, *Сейсмічная шкала* і інш.

СЕЙСМІ́ЧНАЯ РАЗВЕ́ДКА, сукупнасць геафізічных метадаў разведкі, заснаваных на ўзбуджэнні і рэгістрацыі *сейсмічных хваль* з мэтай вывучэння будовы, рэчыўнага саставу і напружанага стану зямных нетраў. Найб. пашыраны метад адбітых хваль, які дазваляе карціраваць межы з дакладнасцю да 1—2% на глыб. да 7—10 км. З дапамогай метаду пераломленых хваль вывучаюць слаі з падвышанай скорасцю сейсмічных хваль. Карэляцыйны метад пераломленых хваль і глыбіннае сейсмічнае зандзіраванне ўжываюць пры рэгіянальных даследаваннях кантынентаў і акіянаў. Мадыфікацыю метаду адбітых хваль (падсумаванне карысных сігналаў, адбітых ад агульнага глыбіннага пункта) выкарыстоўваюць для пошукаў і разве-



кі карысных выкапняў. Адрозніваюць метады С.р. нізка- (менш за 10 Гц), сярэдне- (10—100 Гц) і высокачастотныя (больш за 100 Гц). Нізкачастотныя выкарыстоўваюць для даследаванняў на вял. глыбінях і адлегласцях, высокачастотныя — пры вывучэнні скальных рудных парод (рудная С.р.). Сейсмаакустычныя метады ўмоўна вылучаны ў асобную вобласць паводле дыяпазону частот (600—6 тыс. Гц); выкарыстоўваюць на невял. глыбінях у свідравінах (акустычны каратаж), шахтах і горных выработках, на марскім шэльфе і інш. С.р. ўжываюць пры разведачным свідраванні нафта- і газаносных структур, выяўленні структурных рудных палёў, буйных разломаў, пегматытавых цел і кварцавых жыл (п'езаэл. метад), высвятленні палажэння водаўпораў, узроўню грунтавых вод і інш. С.р. аб'ядноўваюць таксама з гравіметрычнымі, магн. і эл. метадамі *геафізічнай разведкі*.

В.Я.Ключ.

СЕЙСМІ́ЧНАЯ СТА́НЦЫЯ, установа для бесперапыннай рэгістрацыі ваганняў зямной паверхні пры землетрасеннях, выбухах і інш. з дапамогай *сейсмографаў*. Вылучаюць апорныя С.с. (рэгіструюць сейсм. сігналы на адлегласці да эпіцэнтра больш за 2 тыс. км) і рэгіянальныя С.с. (на адлегласці да 2 тыс. км). С.с. свету рэгіструюць землетрасенні па адзіным часе — сярэднім Грынвіцкім. У сусв. сетцы С.с. больш за 2 тыс. стацыянарных, у т.л. ў СНД — каля 350 станцый (адзіная сістэма назіранняў). На Беларусі — 1 апорная С.с. «Мінск» у *Плешчаніцкай геафізічнай абсерваторыі* і 3 рэгіянальныя: «Нарач», «Гомель» (в. Чонкі) і «Салігорск».

В.Я.Ключ.

СЕЙСМІ́ЧНАЯ ШКАЛА́, шкала для ацэнкі інтэнсіўнасці землетрасення. Адрозніваюць С.ш. для ацэнкі энергіі ачагоў землетрасення (шкала магнітуд землетрасенняў або шкала Рыхтэра, дзе магнітуда — умоўная велічыня, прапарцыянальная лагарыфму энергіі, што выпраменьваецца ачагом землетрасення) і для інтэнсіўнасці праяўлення землетрасенняў на паверхні Зямлі (у балах). Аснова для вызначэння інтэнсіўнасці ў 12-бальнай міжнар. шкале (MSK-64) — ступень пашкоджання будынкаў, рэшткавыя дэфармацыі грунту і інш. (гл. табл.).

В.Я.Ключ.

СЕЙСМІ́ЧНЫЯ КА́РТЫ, адлюстроўваюць якасныя і колькасныя характарыстыкі землетрасенняў, іх размяшчэнне і звязаныя з імі з'явы (напр., сейсмадыслакацыі, цунамі). На картах эпіцэнтраў землетрасенняў паказваюць палажэнне эпіцэнтраў, інтэнсіўнасць і частату паўтарэння землетрасенняў, глыбіні ачагоў. Карты ізасейстаў адлюстроўваюць вынікі землетрасення ў выглядзе зон з рознай інтэнсіўнасцю страсення ў балах. Ствараюць таксама карты *сейсмічнага раянавання*.

В.Я.Ключ.

СЕЙСМІ́ЧНЫЯ ХВА́ЛІ, пругкія ваганні, што распаўсюджваюцца ў Зямлі ад ачагоў землетрасенняў, выбухаў і інш. Адрозніваюць падоўжныя С.х. (ваганні адбываюцца ў напрамку распаўсюджвання хвалі, выклікаюць сціскванне і расцяжэнне), папярочныя С.х. (перпендыкулярныя распаўсюджванню хвалі; хвалі зруху), паверхневыя С.х. (узнікаюць каля паверхні падзелу геал. асяроддзяў; хвалі Лява, Рэлея), аб'ёмныя С.х. (падоўжныя і папярочныя хвалі, ідуць ад ачага ўзбуджэння па аб'ёме Зямлі), адбітыя і пераломленыя С.х. (узнікаюць на мяжы падзелу геал. асяроддзяў з рознымі фіз. ўласцівасцямі). Рэгістрацыя С.х. дазваляе даследаваць унутр. будову Зямлі. Гл. таксама *Сейсмаграма, Сейсмічная разведка*.

В.Я.Ключ.

СЕЙСМО́ГРАФ (ад грэч. seismos вагання, землетрасенне + ... *граф*), аўтаматычная прылада для рэгістрацыі ваганняў зямной паверхні пры землетрасеннях, штучных выбухах і інш. Складаецца з сейсмометра, які прымае сейсмічны сігнал і рэгіструючай прылады. Існуюць С. з мех., гальванаметрычным, цеплавым, аптычным, эл. спосабамі рэгістрацыі. Пры сейсмалагічных даследаваннях выкарыстоўваюць С. з перыядам уласных ваганняў 0,3—120 с, у сейсмаразведцы 0,03—0,2 с.

В.Я.Ключ.

Табліца

Міжнародная сейсмічная шкала MSK-64

Балы	Характарыстыка інтэнсіўнасці землетрасенняў
1	Ваганні глебы адзначаюцца прыборамі
2	Адчуваюцца ў асобных выпадках людзьмі, якія знаходзяцца ў спакойным стане
3	Адзначаюцца нямногімі людзьмі
4	Адзначаюцца многімі людзьмі. Магчыма бразгатанне шкла
5	Гайданне вісячых прадметаў. Людзі прачынаюцца
6	Лёгкія пашкоджанні ў будынках, тонкія трэшчыны ў тынкоўцы
7	Трэшчыны ў тынкоўцы і адколванне асобных кавалкаў, тонкія трэшчыны ў сценах
8	Вялікія трэшчыны ў сценах, падзенне карнізаў, комінаў
9	У некаторых будынках абвалы: абрушэнне сцен, перакрыццяў, даху
10	Абвалы ў шматлікіх будынках. Трэшчыны ў грунтах шыр. да 1 м
11	Шматлікія трэшчыны на паверхні Зямлі, вял. абвалы ў гарах
12	Змены рэльефу ў вял. памерах

СЕЙТА́КАЎ Бекі (31.3.1914, с. Бедыркент, цяпер сельсавет імя А.Атаева Ташаузскай вобл., Туркменістан — 5.3.1979), туркменскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Туркменістана (1968). Чл.-кар. АН Туркменістана (з 1969). Скончыў Ташаузскае пед. вучылішча (1931), настаўніцкі ін-т (1944). З 1944 на журналісцкай і пед. рабоце, у 1966—73 працаваў у перыяд. друку. Друкаваўся з 1935. Аўтар паэт: зб-каў «Вершы і паэмы» (1947), «Пустыня адступае» (1951). Тэма вёскі — асн. ў пасляваен. творчасці С. (аповесці «Свет Масквы», 1953; «Неспакойныя людзі», 1958). Мінулае Туркменістана ў рамане «Паэт» (1958), гіст. трылогіі «Браты» (кн. 1—4, 1958—72). Аўтар рамана «Сэрца пустыні» (1962), аповесці «Сын Леніна» (1975), зб-каў апавяданняў, нарысаў, успамінаў. На бел. мову асобныя яго апавяданні пераклаў М.Гіль.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1976.

СЕЙТАЛІЕЎ Тактаналы (н. 3.12.1937, с. Жайылма, Кіргізія), кіргізскі спявак (лірыка-драм. тэнар). Нар. арт. СССР (1984). З 1969 саліст Кірг. т-ра оперы і балета. Сярод партый: Эміль («Чэрвеньская ночь» П.Хаджыева), Сыргак, Кульчора, Керымбай («Манас», «Месячная прыгажуня», «Тактагул» У.Уласава, А.Малдыбаева і У.Ферэ), Альфрэд, Герцаг («Травіята», «Рыгалета» Дж.Вердзі), Ленскі («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага) і інш. Дзярж. прэмія Кіргізіі 1982.

СЕЙТВАЛІЕЎ Сейтнафе (29.5.1919, в. Таў-Кіпчак Белагорскага р-на, Крым, Украіна — 13.3.1983), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941. Разлік гарматы знішчальнай процітанк. батарэі на чале са старшым сяржантам С. вызначыўся ў 1944 пры вызваленні г. Жлобін і ў баі каля г.п. Мар'іна Горка, дзе адбіў некалькі контратак ворага.

СЕЙТЛІЕЎ Кара (1.1.1915, с. Караган Бахардэнскага р-на, Туркменістан — 2.5.1971), туркменскі пісьменнік, дзярж. дзеяч. Нар. пісьменнік Туркменістана (1967). Скончыў Бакінскі пед. ін-т (1941). У 1943—44 дырэктар Туркм. т-ра оперы і балета. У 1963—71 міністр культуры Туркменістана. Друкаваўся з 1938. Аўтар зб-каў вершаў і паэм на тэмы сучаснасці: «Ліра паэта» (1941), «Сістр» (1944), «Крыніца» (1950), «Кветкі Індыі» (1960), «Крылатыя часы» (1962) і інш. Многія яго вершы пакладзены на музыку. Напісаў п'есу «Джахан» (паст. 1946), камедыю «Сын пастуха» і драму «Дачка садоўніка» (з Г.Мухтаравым) і інш. На бел. мову яго асобныя вершы пераклаў Ю.Свірка.

Тв.: Рус. пер. — Избр. лирика. М., 1968; Человек и мир: Стихи и поэмы. М., 1971.

СЕ́ЙФЕРТ (Seifert) Яраслаў (23.9.1901, Прага — 10.1.1986), чэшскі паэт. Нар. пісьменнік Чэхаславакіі (1966). Першы паэт. зб. — «Горад у слязах» (1921). Удзельнік стварэння гуртка пралет. мастацтва «Дзівасіл». У творчасці ім-

кнуўся да паэтызацыі прозы жыцця, абапіраючыся на рэаліст. дэталі і рэліг. сімволіку. У паэт. зб-ках «Толькі каханне» (1923), «На хвалях ТСФ» (1925) апяваў радасць жыцця, экзотыку падарожжаў. Зб. «Салавей спявае дрэнна» (1926) прасякнуты трагічным светаадчуваннем. У зб-ках «Яблык з каленяў» (1933), «Рукі Венеры» (1936) звярнуўся да традыцый класічнай чэш. паэзіі — напеўнасці, меладычнасці, арганічнасці

Я.Сейферт.

сітуацый. Асн. тэмы зб-каў «Патушыце агні» (1938), «Веер Бажэны Немцавай» (1940), «Ішоў бедны мастак па свеце» (1949) — каханне, паэзія, радзіма, прыгажосць Прагі, гісторыя чэш. культуры; зб. «Мамачка» (1954) — успаміны пра дзяцінства. У зб-ках «Канцэрт на востраве» (1965), «Адліванне званоў» (1967), «Парасон з Пікадылі» (1979) пераважае верлібр, які стаў дамінантай яго паэтыкі. Аўтар зб-каў «Моравы слуп» (1981), «Быць паэтам» (1983) і інш. На бел. мову яго асобныя вершы пераклалі А.Разанаў, М.Танк. Дзярж. прэмія Чэхаславакіі 1936, 1955. Нобелеўская прэ́мія 1984.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Высокае неба. Мн., 1980; У кн.: На зорных шляхах. Мн., 1991; Рус. пер. — Прощание с весной: Избр. лирика. М., 1987. *А.У.Вострыкава.*

СЕЙФУ́ЛІН Сакен (Садвакас; 12.6.1894, качавы аул у Джэзказганскай вобл., Казахстан — 25.2.1939), казахскі пісьменнік, грамадскі дзеяч; пачынальнік новай каз. л-ры. Скончыў Омскую настаўніцкую семінарыю (1916). Настаўнічаў, у 1925—37 працаваў у перыяд. друку. Рэпрэсіраваны, рэабілітаваны пасмяротна. Друкаваўся з 1910. Асн. ў яго творчасці — тэма рэвалюцыі і буд-ва новага жыцця (паэт. зб-кі «Неўтаймаваны конь», 1922; «Домбра», 1924; «Экспрэс», 1926; «На хвалях жыцця», 1928; п'есы «Шлях да шчасця», нап. 1917; «Чырвоныя сокалы», нап. 1920). Лепшыя традыцыі нар. паэзіі развіваў у паэмах «Разлучаныя лебедзі» (1925), «Саветстан» (1926), «Какчэтаў» (1929), «Альбатрос» (1933). Аўтар гісторыка-мемуарнага рамана «Цяжкі шлях, нялёгкі пераход» (1927), аповесцей «Айша» (1922, перапрацавана ў 1935), «Землякопы» (1928), «Здабыткі» (1935) і інш. На бел. мову яго асобныя апавяданні пераклаў П.Міська.

Тв.: Рус. пер. — Тернистый путь. Алма-Ата, 1964; Хамит в погоне за бандитом: Рассказы. Алма-Ата, 1971; Стихотворения и поэмы. Л., 1973 (разам з І.Джансугуравым).

Літ.: Какишев Т. Сакен Сейфуллин. М., 1972; Кирабаев С. Сакен Сейфуллин: Критико-биогр. очерк. М., 1973. *Ж.Сахіеў.*

СЕЙФУ́ЛІНА Лідзія Мікалаеўна (3.4.1889, пас. Верхнеўвельскі Чэбаркульскага р-на Чэлябінскай вобл., Расія — 25.4.1954), руская пісьменніца. Скончыла Вышэйшыя пед. курсы ў Маскве (1920). Працавала бібліятэкарам, настаўніцай, актрысай. У апавяданнях, аповесцях «Чатыры главы», «Ноеў каўчэг», «Перагной» (усе 1922), «Вірынея» (1924; інсцэніравана з В.Праўдухіным, у 1925; аднайм. опера створана ў 1967 кампазітарам С.Сланімскім, фільм у 1969), «Сустрэча» (1925) і інш. ломка вясковага побыту пасля 1917, змены ў псіхалогіі жанчын. Аповесць «Правапарушнікі» (1922) пра беспрытульнікаў. Пра Вял. Айч. вайну аповесць «На сваёй зямлі» (1946). Аўтар п'ес «Спадарожнікі» (паст. 1932), «Наташа» (1937), «Сын» (1947, апубл. 1959), кн. «Пра літаратуру» (1958), успамінаў і інш. На бел. мову асобныя яе творы пераклалі М.Байрашэўская, П.Місько і інш.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—4. М., 1968—69; Соч. Т. 1—2. М., 1980; Бел. пер. — Правапарушнікі. Мн., 1930; Таня. Мн., 1937.

Літ.: Лидия Сейфуллина в воспоминаниях современников. М., 1961; Яновский Н.Н. Лидия Сейфуллина. 2 изд. М., 1972.

СЕЙХА́Н (Seyhan), горад у Турцыі, гл. *Адана*.

СЕ́ЙШЫ (ад франц. seiches), стаячыя хвалі вялікага (ад некалькіх мінут да дзесяткаў гадзін) перыяду, без пашырэння профілю хваль на паверхні замкнёных або паўзамкнёных вадаёмаў. Утвараюцца па інерцыі пасля спынення ветру, сейсмічных штуршкоў, рэзкіх змен атм. ціску або выпадзення інтэнсіўных ападкаў у розных частках вадаёма і інш. Частыя ў азёрах, калі паверхня возера нахіляецца папераменна ў розныя бакі. Нерухомая вось, вакол якой вагаецца люстэрка возера, наз. вузлавой лініяй. С. бываюць адна- і двухвузлавыя, з амплітудамі ад некалькіх міліметраў да некалькіх метраў (напр., у Жэнеўскім воз. амплітуда да 2 м з перыядам больш за 1 гадз). Назіраюцца на азёрах Беларусі: на воз. Нарач выш. хваль да 25 см, перыяды 45—51 мін, на меншых азёрах — 1—2 см, 10—15 мін.



Сейшы: 1 — аднавузлавыя; 2 — двухвузлавыя.

СЕЙШЭ́ЛЬСКІЯ АСТРАВЫ́ (Seychelles), Рэспубліка Сейшэльскія Астравы (Republic of Seychelles),

Герб і сцяг **Сейшэльскіх Астравоў**.

дзяржава ў зах. ч. Індыйскага ак., на ПнУ ад в-ва Мадагаскар. Уваходзяць Сейшэльскія а-вы (пл. каля 250 км^2, найб. в-аў Маэ, пл. 154 км^2), а-вы Аль-



дабра (пл. 145 км^2), Аміранцкія, Касмаледа, Фаркуар і інш. Усяго 90 астравоў, агульная іх пл. 455 км^2. Нас. 79,3 тыс. чал. (2000). Дзярж. мовы — англійская, французская, крэольская, або сеселва (сфарміравалася на базе франц. мовы і суахілі). Сталіца, найб. горад і порт — *Вікторыя* на в-ве Маэ. Адм. падзел — 23 дыстрыкты. Нац. свята — Нацыянальны Дзень (18 ліп.).

Дзяржаўны лад. С.А. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1993. Кіраўнік дзяржавы і ўрада — прэзідэнт, які выбіраецца насельніцтвам на 5 гадоў. Заканад. ўлада належыць аднапалатнаму Нац. сходу (34 дэпутаты; 25 выбіраюцца ўсеагульным галасаваннем, 9 назначаюцца прэзідэнтам).

Прырода. Уваходзяць 40 гарыстых (да 912 м на в-ве Маэ), складзеных з крышталічных парод, і 50 нізінных каралавых астравоў. Клімат субэкватарыяльны з вельмі вільготным летам і менш вільготнай зімой. Сярэднія месячныя т-ры ад 26 да 28 °С. Выпадае 2000—4000 мм ападкаў за год. Ва ўнутр. частках астравоў захаваліся трапічныя лясы (11% пл. краіны) з пальмамі, пандануса мі, дрэвападобнымі папарацямі. Вял. плошчы пад другаснымі хмызнякамі. Каля $^1/_3$ расл. відаў эндэмічныя. У жывёльным свеце вылучаюцца вялікія сухапутныя і марскія чарапахі (вагой да 250 кг). Адсутнічаюць мясц. млекакормячыя, няма насякомых, якія лётаюць. Шмат марскіх птушак. Мора багатае рыбай. Рэзерват а-воў Альдабра і нац. парк Вале-дэ-Маі на в-ве Праслен уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*; марскі нац. парк Сент-Ан, на в-ве Кузен птушыны запаведнік і інш.

Насельніцтва. Асн. народ сейшэльцы, або крэолы С.А., — нашчадкі афрыканцаў, малагасійцаў, французаў, выхадцаў з краін Азіі, складаюць каля 90% насельніцтва. Жывуць таксама індзійцы, малагасійцы, кітайцы і англічане. Вернікі пераважна католікі (90%) і англікане (8%). Сярэднегадавы прырост 0,6% (1999), Сярэдняя шчыльн. 174,3 чал. на 1 км^2. Населены толькі 33 найб. астравы, на в-ве Маэ каля 65 тыс. чал., у т.л. у г. Вікторыя — каля 25 тыс. ж. (2000). Гар. насельніцтва 63%. У прам-сці занята 19% працаздольных, у абслугоўвых галінах — 57%, у кіраванні — 14%, у сельскай гаспадарцы, рыбалоўстве і лясной гаспадарцы — 10%.

Гісторыя. С.А. былі вядомы араб. і інд. мараплаўцам. Адкрыты партугальцамі ў пач. 16 ст. У 1609 тут высадзіліся англ. маракі; у 1756 французы стварылі на С.А. першыя пасяленні. З 1794 — уладанне Вялікабрытаніі, з 1903 — асобная брыт. калонія. У 1970 створана Заканад. асамблея, а Сейшэлы атрымалі самакіраванне. 29.6.1976 абвешчана незалежнасць Рэспублікі Сейшэльскіх Астравоў, яе прэзідэнтам стаў лідэр Дэмакр. партыі Дж.Менчэм, прэм'ер-міністрам — кіраўнік Аб'яднанай партыі Сейшэлаў (АПС, з 1978 Прагрэсіўны фронт народа Сейшэлаў, ПФНС) Ф.А.Рэнэ. У чэрв. 1977 АПС здзейсніла дзярж. пераварот, прэзідэнтам краіны стаў Рэнэ. У 1979 прынята новая канстытуцыя, якая абвясціла краіну «суверэннай сацыяліст. рэспублікай», а адзінай дазволенай партыяй — ПФНС. З пач. 1990-х г. пачалася дэмакратызацыя паліт. жыцця. Канстытуцыя 1993 замацавала шматпартыйнасць. На выбарах 1993 і 1998 перамог ПФНС, а Рэнэ двойчы абраны прэзідэнтам краіны. Дыпламат. адносіны з Беларуссю ўстаноўлены ў кастр. 2001. На С.А. дзейнічаюць паліт. партыі: Прагрэсіўны фронт народа Сейшэлаў; Новая дэмакр. партыя. С.А. — чл. ААН (з 1976), Арг-цыі афр. адзінства.

Гаспадарка. С.А. — аграрная краіна сярэднята ўзроўню развіцця, важнае значэнне для яе эканомікі маюць рыбалоўства і замежны турызм. Валавы ўнутр. прадукт на 1 чал. складае каля 7000 дол. за год. 4% яго ствараецца ў сельскай гаспадарцы, 15% — у прам-сці, 81% — у абслуговых галінах, пераважна ў турысцкай справе. С.А. — краіна развітога міжнар. турызму (штогод астравы наведваюць каля 150 тыс. замежных турыстаў, даход ад турызму ў 1998 — 111 млн. дол.). У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 8 тыс. га зямлі, у т.л. пад ворывам і шматгадовымі насаджэннямі каля 7 тыс. га, пад пашай каля 1 тыс. га. Экспартныя культуры вырошчваюць пераважна на плантацыях, ёсць дробныя сялянскія гаспадаркі. Гал. культуры: какосавая пальма (збор копры каля 4 тыс. т штогод), карыца, ваніль, гваздзіка, чай. Культывуюць таксама маніёк, батат, бананы, хлебнае дрэва, тытунь, манга, ананасы, каву, цукр. трыснёг, агародніну. Плантацыі араматычных культур на а-вах Маэ, Праслен, Ла-Дыг. На Пн в-ва Маэ плантацыі чаю. Жывёлагадоўля мае другараднае значэнне. Гадуюць буйн. раг. жывёлу (каля 2 тыс. галоў) і свіней (каля 3 тыс. галоў). Птушкагадоўля (540 тыс. курэй, 1997). Рыбалоўства (каля 10 тыс. т штогод, пераважна тунец) і промысел марскіх чарапах. Існуюць рыбалавецкія кааператывы. Збор гуана. Прам-сць заснавана на с.-г. сыравіне. Ёсць дробныя прадпрыемствы па перапрацоўцы какосавых арэхаў, вытв-сці вяровак з іх валакна, карычнага алею, апрацоўцы і расфасоўцы ванілі, чаю, рыбамаразільнікі і рамонтныя майстэрні. Вытв-сць мыла, піва, безалкагольных напіткаў, тытунёвых вырабаў. Буд-ва дробных суднаў і суднарамонт. У г. Вікторыя прадпрыемствы харчасмакавай, мэблевай, радыёэлектроннай, рыбаперапр. прам-сці. Вытв-сць электраэнергіі 125 млн. кВт·гадз (1998). Развіта саматужная вытв-сць ганчарных вырабаў, сувеніраў, вырабаў з валокнаў пальмаў і панцыраў чарапах. Транспарт марскі і аўтамабільны. На астравах 280 км аўтадарог, у т.л. 176 км з цвёрдым пакрыццём, 6,6 тыс. легкавых аўтамабіляў, 1,9 тыс. грузавых і аўтобусаў; 14 аэрапортаў і аэрадромаў, у т.л. міжнар. аэрапорт на в-ве Маэ. Асн. астравы звязаны рэйсамі невял. суднаў. У 1998 экспарт склаў 53 млн. дол., імпарт — 340 млн. дол. У экспарце пераважаюць копра (45% па кошце), карыца, ваніль і гваздзіка (каля 20%), рыба і рыбапрадукты (каля 20%), чай (каля 7%); у імпарце — харч. і прамысл. тавары, паліва. Гал. гандл. партнёры: Францыя, Вялікабрытанія, Германія, Кітай, Паўд.-Афр. Рэспубліка. Краіна атрымлівае эканам. дапамогу ад Вялікабрытаніі. Грашовая адзінка — сейшэльская рупія.

І.Я.Афнагель (прырода, насельніцтва, гаспадарка).

Да арт. **Сейшэльскія Астравы.** Узбярэжжа востраваПраслен.

СЕКА́М (Secam, скар. ад Sequential Couleur Avec Memoire паслядоўная перадача колераў з запамінаннем), сістэма *каляровага тэлебачання* з пачарговай (праз радок) перадачай 2 колерарозных сігналаў пры неперарыўнай перадачы сігналу яркасці. Асаблівасці — магчыма перадача сігналаў на вял. адлегласці пры малым узроўні колеравых скажэнняў, неадчувальнасць да фазавых скажэнняў. Прапанавана франц. інжынерам А. дэ Франсам (1954), для вяшчання прынята ў 1967.

Абодва колерарозносныя сігналы перадаюцца на дапаможных паднясучых частотах, трэці сігнал колернасці (зялёны) фарміруецца ў тэлевізійным прыёмніку прапарцыянальным складаннем (у спец. матрычным прыстасаванні) частак першых двух сігналаў. Для яго фарміравання прыёмнік мае лінію затрымкі на працягласць перадачы аднаго радка (64 мс) з мэтай адначасовага паступлення сігналаў у матрычнае прыстасаванне. Прынята ў 56 краінах, мае 7 версій (1990). Гл. таксама *НТСЦ, ПАЛ.*

СЕ́КАНДЫ-ТАКАРА́ДЫ, Секонды-Такарады (Sekondi-Takoradi), горад у Гане на ўзбярэжжы Гвінейскага заліва. Адм. ц. Заходняй вобласці. Каля 450 тыс. ж. з прыгарадамі і суседнімі гарадамі (2001). Порт на ўзбярэжжы Гвінейскага зал. (вываз баксітаў, марганцавай руды, какавы, драўніны), вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: трансп. машынабудаванне, харч., дрэваапр., цэм., тытунёвая. Суднаверфі. Цэнтр рыбалоўства.

СЕ́КАЧ Сямён Фядосавіч (н. 19.1.1929, в. Хатунічы Чарнігаўскага р-на, Украіна), бел. вучоны ў галіне нейрахірургіі. Д-р мед. н. (1972). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1955). З 1958 у НДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі. Навук. працы па праблеме паталогіі сонных артэрый.

Тв.: Результаты хирургического лечения тромбоза и стеноза внутренней сонной артерии. М., 1964; Операции на мелких артериях в эксперименте. Мн., 1969.

СЕКВЕ́СТР (ад лац. sequestro стаўлю па-за, аддзяляю), 1) забарона ці абмежаванне, якое накладаецца дзяржавай на карыстанне якой-н. маёмасцю. 2) Канфіскацыя ў памешчыкаў Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны маёнткаў з сялянамі за апазіцыйную дзейнасць супраць рас. улад у канцы 18 — пач. 1-й пал. 19 ст. 3) У цывільным праве Рэспублікі Беларусь права абмежаванага карыстання чужой нерухомай мёмасцю (зямельным участкам, збудаваннямі і інш.). С. можа ўстанаўлівацца для забеспячэння праходу і праезду праз суседні зямельны ўчастак, пракладкі і эксплуатацыі лініі электраперадач, сувязі і трубаправодаў, водазабеспячэння, каналізацыі і меліярацыі, а таксама інш. патрэб уласніка нерухомасці, якія не могуць быць ажыццёўлены без устанаўлення С. Парадак устанаўлення С., яго ўмовы, інш. акалічнасці, аб'екты, што могуць абмяжоўвацца С., вызначаюцца заканадаўствам. 4) У бюджэтным праве спец. механізм, які ўводзіцца ў выпадках, калі пры выкананні бюджэта адбываецца перавышэнне ўстаноўленага ўзроўню бюджэтнага дэфіцыту або скарачаюцца паступленні з даходных крыніц, а таксама ў выпадку, калі ў ходзе выканання бюджэту дэфіцыт не змяншаецца, у выніку чаго становіцца немагчымым фінансаванне прадугледжаных у бюджэце мерапрыемстваў. Механізм С. заключаецца ў прапарцыянальным зніжэнні дзярж. выдаткаў на пэўную колькасць працэнтаў штомесячна па ўсіх артыкулах бюджэту на працяг часу бягучага фін. года, які застаўся. *Г.А.Маслыка.*

СЕКВО́Я (Sequoia), род голанасенных раслін сям. таксодыевых. 1 рэліктавы від — С. вечназялёная (S. sempervirens). Трапляецца на зах. узбярэжжы Паўн. Амерыкі, у гарах Каліфорніі і Паўд. Арэгона (ЗША). Утварае парасткавыя лясы. У Еўропе і Азіі рэшткі С. выяўлены ў юрскіх і ніжнемелавых пластах. Культывуецца.

Вечназялёныя хваёвыя дрэвы з вузкаканічнай кронай. Адносяцца да найвыш. дрэў (выш. ствала 110—112 м, дыяметр 6—10 м). Жывуць больш за 3 тыс. гадоў. Ігліца лінейна-ланцэтная, размешчана грабеньчата. Шышкі амаль шарападобныя, даўж. 2—3 см. Насенне з доўгімі крыльцамі. Драўніна светла-чырв., выкарыстоўваецца для падводных збудаванняў, мэблі і інш. *І.М.Гарановіч.*

СЕКВО́Я (Sequoia), нацыянальны парк у ЗША, у Каліфорніі, на зах. схілах хр. Сьера-Невада. Засн. ў 1890. Пл. 163,1 тыс. га. Горныя ландшафты (г. Уітні выш. 4418 м) з лугамі, вадаспадамі, гаямі секвоі. Прылягае да нац. парку *Кінгс-Каньён*. Біясферны рэзерват.

СЕКВОЯДЭ́НДРАН, мамантавае дрэва, велінгтонія (Sequoiadendron), род голанасенных раслін сям. таксодыевых. 1 рэліктавы від — С. гіганцкі (S. giganteum). Пашыраны ў Паўн. Амерыцы (Каліфорнія). Выкапнёвыя рэшткі выяўлены ў Паўн. паўшар'і. Культывуецца ў парках і садах Сярэдняй Еўропы і на Пд Еўразіі.

Вечназялёныя хваёвыя дрэвы. Жывуць да 2,5 тыс. (паводле інш. звестак, да 3—4 тыс.) гадоў. Ствол прамы, стройны, выш. да 100 м, дыяметрам да 10 м, у старых дрэў свабодны ад галін амаль да палавіны. Крона густая, канічная або акруглая. Ігліца размешчана спіральна, шышкі даўж. 5—7,5 см. Некат. гіганцкія экзэмпляры маюць уласныя імёны. Дэкар. расліны. *І.М.Гарановіч.*



Секвоя вечназялёная.



Секвоядэндран гіганцкі.

СЕ́КЕШФЕ́ХЕРВАР (Székesfehérvár), горад у цэнтр. ч. Венгрыі. Засн. ў 11 ст. на месцы стараж.-рым. паселішча Альба-Рэгія. Да сярэдзіны 16 ст. месца каранавання і пахавання венгерскіх каралёў. Каля 110 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: маш.-буд., каляровая металургія, дрэваапр., тэкст., харчовая. Карцінная галерэя імя І.Чока. Руіны раманскай базілікі (11 ст.), гатычная капліца (15 ст.), барочныя сабор (18 ст.) і касцёл кармелітаў (18 ст.); Палац біскупа (19 ст.) у стылі класіцызму і інш.

СЕКС (франц. sexe ад лац. sexus пол), сукупнасць псіхічных і фізіял. рэакцый, перажыванняў і ўчынкаў, звязаных з праяўленнем і задавальненнем палавой цягі (гл. *Лібіда*). Агульнай біял. асновай сексуальных паводзін з'яўляецца інстынкт працягу роду.

СЕКСАЛО́ГІЯ (*секс* + *...логія*), навука, якая вывучае палавыя функцыі чалавека ў фізіял., псіхал. і сац. аспектах. Засн. на інтэграцыі медыцыны з рознымі аспектамі немед. навук (псіхалогія, сацыялогія, педагогіка, філасофія і інш.). У С. значная ўвага аддаецца праяве сексуальнай патрэбы ў адпаведнасці з уплывам сац. асяроддзя, пытанням нормы і адхіленняў у палавых паводзінах (цесна змыкаецца з *сексапаталогіяй*).

Вылучылася і стала самаст. у 20 ст. Першымі пачалі сістэм. вывучэнне палавога жыцця (пераважна паталаг. форм) урачы. Сярод заснавальнікаў С. праф. псіхіятрыі Венскага ун-та Р. Крафт-Эбінг, швейц. неўрапатолаг А.Фарэль, З.*Фрэйд*, ням. дэрматолаг і венеролаг І.Блох і інш. Апошнія даследаванні ў эмбрыялогіі, эндакрыналогіі, нейрафізіялогіі, эвалюц. біялогіі, гінекалогіі і інш. навуках дазволілі значна ўзбагаціць і пашырыць веды ў галіне дыферэнцыяцыі і ўзаемаадносін полаў.

Літ.: Имелинский К. Сексология и сексопатология: Пер. с пол. М., 1986; Фрейд З. Очерки по психологии сексуальности: Пер. с нем. М., 1990; Сексология: Энцикл. справ... 3 изд. Мн., 1995.

СЕКСАПАТАЛО́ГІЯ (*секс* + *...патало́гія*), галіна клінічнай медыцыны, якая вывучае палавыя расстройствы, распрацоўвае метады іх дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі; раздзел мед. *сексалогіі*. Вывучае функцыян., эмацыянальныя, асабістыя, сац.-адаптацыйныя аспекты сексуальных расстройстваў. Звязана з уралогіяй, гінекалогіяй, андралогіяй, эндакрыналогіяй, неўрапаталогіяй, псіхіятрыяй. Падзяляецца на агульную і прыватную. Агульная С. вывучае асн. заканамернасці суадносін і дыферэнцыяцыі полаў, анатама-фізіял. асновы палавой сферы і інш.; прыватная — канкрэтныя захворванні, якія парушаюць сексуальную функцыю, іх лячэнне з улікам спецыфічных псіхасексуальных асаблівасцей хворага. У С. вял. роля належыць прынцыпу партнёрства, які ўлічваецца ў дыягностыцы, паходжанні парушэнняў і іх лячэнні.

Літ.: Свядощ А.М. Женская сексопатология. 5 изд. Кишинев, 1991; Ходаков Н.М. Наедине с сексопатологом. М., 1992; Здравомыслов В.И., Анисимова З.Е., Либих С.С. Функциональная женская сексопатология. Пермь, 1994; Руководство по андрологии. Л., 1990.

СЕКСТ ЭМПІ́РЫК (Sextus Empiricus; каля 200—250), старажытнагрэчаскі філосаф і ўрач, прадстаўнік *скептыцызму*. Вылучаў 3 віды філасофіі: дагматычную, акадэмічную і скептычную. Крытыкаваў дагматычную філасофію (логіка, фізіка, этыка), якая, на яго думку, прэтэндуе на валоданне абсалютнай ісцінай; зрабіў выснову пра неабходнасць адмаўлення ад догмаў. Акадэмічную філасофію (Аркесілай, Лакід, Тэлеклет, Карнеад і інш. прадстаўнікі Сярэдняй і Новай акадэміі) асуджаў за абсалютызацыю прынцыпу недаступнасці ісціны. У працах «Супраць вучоных» і «Піронавы асноўныя прынцыпы» на аснове фармальна-лагічнага закону крытыкаваў граматыку, рыторыку, геаметрыю, арыфметыку, астралогію, тэорыю музыкі, лагічнае, фіз. і этычнае вучэнні, рэліг. вераванні. На яго думку, мэтай скептычнай філасофіі з'яўляецца дасягненне спакою і асабістага шчасця шляхам устрымання ад меркаванняў. Лічыў, што скептык нічога не сцвярджае і не адмаўляе, а «шукае» ісціну. У гнасеалогіі прытрымліваўся ідэі ўсеагульнай «цякучасці рэчаў» і адвечнага станаўлення. Адмаўляў мэтазгоднасць актыўнага ўдзелу ў паліт. жыцці грамадства; лічыў, што для дасягнення спакою неабходна падпарадкоўвацца абставінам, законам і звычаям. Сістэматызаваў спадчыну папярэдніх філосафаў-скептыкаў і інш. стараж.-грэч. філосафаў.

Тв.: Рус. пер. — Соч. Т. 1—2. М., 1975—76; Три книги Пирроновых основоположений. Мн.; М., 2000. *Т.І.Адула, А.Б.Савеня.*

СЕ́КСТА ў музыцы, гл. ў арт. *Інтэрвал*.

СЕКСТА́НТ (лац. Sextans), экватарыяльнае сузор'е. Найб. яркая зорка 4-й візуальнай *зорнай велічыні*. На тэр. Беларусі відаць зімой і вясной. Гл. *Зорнае неба*.

СЕКСТА́НТ [ад лац. sextans (sextantis) шостая частка; у марской справе часцей секстан], вугламерны адбівальны інструмент, асн. частка якога — дуга памерам у $^1/_6$ частку акружнасці (60°), падзеленая на градусы і долі градуса (лімб). Вымярае вуглы да 120°. Выкарыстоўваецца ў мараходнай і авіяц. астраноміі для вымярэння вышынь нябесных свяціл і берагавых прадметаў над гарызонтам, а таксама вуглоў паміж бачнымі з карабля прадметамі.

Выявы аб'ектаў, напр., нябеснага свяціла і марскога гарызонту, паміж якімі вымяраецца вуглавая адлегласць, сумяшчаюцца ў трубе С. Гэта дае магчымасць не замацоўваць С. на нерухомай аснове, рабіць вымярэнні, трымаючы яго ў руках. Для астр. вызначэння месца карабля ці самалёта С. вымяраюць вышыні некалькіх нябесных свяціл, а потым будуюць вышынныя лініі становішча з улікам папраўкі на паніжэнне гарызонту з прычыны шарападобнасці Зямлі.



Схема **секстанта**: 1, 3 — святлафільтры; 2, 4 — люстэркі; 5 — падзорная труба; 6 — шкала; φ — вугал паміж напрамкамі на нябеснае свяцілa і гарызонт.

СЕКСТЫЛЬЁН (франц. sextillion), лік, які выражаецца адзінкай з 21 нулём — лік 10^{21}. У некаторых краінах С. наз. лік 10^{36}.

СЕКСТЫ́НА, сестына (позналац. sextina, італьян. sestina ад лац. sex шэсць), верш ці страфа з 6 радкоў, аб'яднаных дзвюма рыфмамі:

Не золатаздабытчык і не бос —
Дваццатым векам вызвалены атам,
Жыплошчу пазычаю я ў нябёс,
Каб быць для іх таварышам і братам.
Але і гэта не апошні лёс,
Які мне векам суджаны дваццатым.
(*А.Куляшоў*. «Мне кожны год,
нібы жыццём другім...»)

Сустракаюцца С. з інш. рыфмоўкай: аааабб, аабааб, аббааа. У сучасным літ.-знаўстве змест паняцця «С.» пашыраны — так называюць 6-радкоўі, якія складаюцца з 4-радкоўя з перакрыжаванай рыфмоўкай і 2-радкоўя з сумежнай рыфмай («Белыя яблыні» П.Панчанкі). Часам С. лічаць 6-радкоўе ўвогуле. С. пішацца звычайна 5- або 6-стопным ямбам. Аднак могуць выкарыстоўвацца і інш. памеры, напр., харэй («Партызанская песня» Я.Коласа). У еўрап. і рус. л-рах вядома складаная С. (уключае 6 шасцірадкоўяў, радкі у якіх рыфмуюцца ў дакладна вытрыманай паслядоўнасці). У рус. л-ры складаныя С. пісалі Л.Мей, В.Брусаў. Вядома і ў бел. паэзіі («На сконе дзён» Р.Суніцы).

А.А.Майсейчык.

СЕКСТЭ́Т (ням. Sextett ад лац. sextus шосты), 1) ансамбль з 6 выканаўцаў. На Беларусі ў 1962—71 існаваў С. домраў, які даў пачатак камерна-інстр. ансамблю Белтэлерадыёкампаніі. 2) Музычны твор для 6 выканаўцаў (інструменталістаў або вакалістаў); адзін з відаў *камернай музыкі* (як і *квартэт*, *квінтэт* і *септэт*). Першы вядомы С. належыць Л.*Бакерыні*. Найб. пашыраны струнныя С., існуюць таксама С. для духавых, нар. і інш. інструментаў. Звычайна маюць *санатна-цыклічную форму*, пашыраны і інш. цыклічныя (*сюіта*) і нецыклічныя формы. Найб. вядомыя С. І.Брамса, Ф.Мендэльсона, А.Дворжака, П.Чайкоўскага, А.Шонберга. Вакальныя С. сустракаюцца пераважна ў операх («Дон Жуан» В.А.Моцарта). У бел. музыцы прадстаўлены ў творчасці М.Аладава, Я.Касалапава, П.Падкавырава, Р.Пукста, М.Шнейдэрмана і інш. 3) У вершаскладанні — тое, што *шасціра́дкоўе*.

Т.А.Дубкова (музыка).

СЕ́КТА (ад secta вучэнне, школа, кірунак), рэлігійная абшчына, група, якая адкалолася ад пануючай царквы; таксама ўсякая адасобленая група людзей, якая замкнулася ва ўласных вузкіх інтарэсах.

СЕКТА́НЦТВА (ад *секта*), рэлігійныя аб'яднанні, што ўзнікаюць як апазіцыя да пэўнай царквы. У царк. практыцы С. наз. *ерасямі*. Падставай для ўзнікнення С. з'яўляецца інш. тлумачэнне пэўных прынцыпаў веравызнання або элементаў культавай практыкі. Вытокі С. карэняцца ў канфесіянальным асяроддзі (пратэст супраць кіраўніцтва царквы, амбіцыёзнасць нефармальных лідэраў і інш.) ці ў грамадскай рэчаіснасці (незадаволенасць сац. становішчам, дзярж. уладай, якую падтрымлівае царква). Істотнымі рысамі С. з'яўляюцца паглыблены містыцызм, імкненне выключным чынам тлумачыць рэліг. дактрыны, спрашчэнне абраднасці, тэндэнцыя ізаляцыі ад грамадства, наяўнасць настрою абранасці, актыўная місіянерская дзейнасць і інш. У практыцы С. назіраюцца 2 процілеглыя тэндэнцыі: працэс далейшай дыферэнцыяцыі, драбленне на новыя *секты* і пераўтварэнне сект у цэрквы з рэгенерацыяй інстытута святароў, цэнтралізаванай сістэмай кіравання. Рэліг. аб'яднанні пераходнага тыпу, якія ўзніклі як секты і знаходзяцца на стадыі пераўтва-

рэння ў самаст. царкву, наз. *дэнамінацыямі*. Некат. секты эвалюцыяніравалі ў самаст. цэркы (гл. *Пратэстантызм*). Рэліг. аб'яднанні, якія характарызуюцца антысац. дзеяннямі (чалавечыя ахвярапрынашэнні, тэрарызм і інш.), поўнай падпарадкаванасцю паводзін і свядомасці вернікаў кіраўніцтву наз. дэструктыўнымі, таталітарнымі сектамі. Дзейнасць такіх сект забаронена ў большасці краін свету. У Рэспубліцы Беларусь забаронены рэліг. аб'яднанні сатаністаў, шайва-шактыстаў, «Аум Сенрыкё», «Саенталагічная царква», «Белае брацтва» і інш. *А.А.Цітавец.*

СЕ́КТАР (лац. sector), 1) частка плошчы фігуры (гл. *Сектар* у геаметрыі). 2) Частка якой-н. плошчы, абмежаванай радыяльнымі лініямі (напр., С. назірання, С. стадыёна). 3) Аддзел установы, арганізацыі, які мае пэўную спецыялізацыю. 4) Частка нар. гаспадаркі, якая мае пэўныя эканам. і сац. прыкметы (напр., С. кааператыўны). 5) Спец. ўчастак сістэмы кіравання самалёта, карабля і інш.

СЕ́КТАР у геаметрыі, 1) С. на плоскасці — плоская фігура, абмежаваная 2 паўпрамымі, што выходзяць з унутр. пункта фігуры, і дугой контуру. С. круга — фігура, абмежаваная 2 радыусамі і дугой, на якую яны апіраюцца. Плошча С. круга роўная $lr/2$ ці $\pi r^2\alpha/360$, дзе l — даўжыня дугі, α — адпаведны гэтай дузе цэнтр. вугал у градусах і r — радыус круга. 2) С. у прасторы — частка цела, абмежаваная канічнай паверхняй, вяршыня якой знаходзіцца ўнутры цела, і выразанай ёю часткай паверхні цела.

СЕКУЛЯРЫЗА́ЦЫЯ (франц. sécularisation ад позналац. saecularis свецкі), 1) адчужэнне царкоўнай маёмасці на карысць дзяржавы. Праводзілася ў розных краінах свету з мэтай паслаблення эканам. магутнасці і паліт. ролі царквы ў дзяржаве.

На Беларусі ажыццяўлялася ў 18 — пач. 20 ст. У Рас. імперыі ўрад Кацярыны II адабраў у правасл. царквы населеныя маёнткі ў 1760-я г. Аднак на землях Беларусі, далучаных у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, царызм не рашаўся ісці на абвастрэнне адносін з моцным і ўплывовым каталіцкім клірам, таму тут канфіскацыя маёнткаў у духавенства абмежавалася толькі агульнымі мерамі, што ўжываліся да ўладальнікаў, якія заставаліся за мяжой ці выступілі супраць рас. улады. Канфіскацыі ў 1770—90-я г. закранулі частку царк. маёнткаў (больш за 40 тыс. рэвізскіх душ), што належалі пераважна Віленскаму біскупству. У Рэчы Паспалітай у 1773 быў скасаваны ордэн *езуітаў*, а яго маёнткі перададзены Адукацыйнай камісіі, якая распрадала іх шляхце. На 1790 у паезуіцкіх маёнтках на тэр. зах. і цэнтр. Беларусі знаходзіліся 644 гарадскія і 7179 сельскіх дымоў. Ва ўсх. Беларусі езуіты захаваліся да высылкі іх з Рас. імперыі паводле ўказа 1820. Палажэннем К-та міністраў і ўказам Сената ад 13.4.1822 35 маёнткаў (9830 рэвізскіх душ), што належалі езуітам, канфіскаваны і замацаваны за казной. Карэнны пералом у адносінах царызму да царк. маёмасці ў зах. губернях настаў пасля паўстання 1830—31 з мэтай нейтралізацыі шляхецка-каталіцкай апазіцыі. Указам ад 19.7.1832 ад ліквідацыі некамплектных (што не мелі поўнага складу манахаў) рымска-каталіцкіх кляштараў іх маёнткі перададзены ў склад казны. У 1837 на Беларусі былі 93 паманастырскія маёнткі з 10 183 рэвізскімі душамі. У час хваляванняў у Віцебскай і Магілёўскай губ. з-за пераводу уніятаў у праваслаўе (1833 і 1834) у рымска-каталіцкага і уніяцкага духавенства канфіскавана 5 маёнткаў і ўстаноўлена казённае кіраванне яшчэ адным. Паводле 8-й рэвізіі (1834) у паўніяцкіх вёсках налічваліся 2894 рэвізскія душы. 25.12.1841 падпісаны шэраг указаў аб прыёме ў дзярж. маёмасць усіх населеных маёнткаў вышэйшага правасл. і іншавернага духавенства зах. губерняў; 10.5.1843 — аб перадачы ў казну населеных маёнткаў прыходскіх цэркваў; 28.2.1844 — вылучаных па «эксдывізіях» (па рашэнні суда) на ўласнасць каталіцкага духавенства. Такіх падуховных маёнткаў у 1847 у 5 бел. губернях было 546 і 87 269 рэвізскіх душ сялян; трэцяя частка з іх прыпадала на Віленскую губ. Асн. маса зямельных уладанняў была адабрана ў каталіцкага духавенства, бо правасл. царква мела параўнальна невял. колькасць сялян. Вышэйшае духавенства, незадаволенае пазбаўленнем матэрыяльных сродкаў, рабіла ўсё, каб пакінуць у сваім распараджэнні найб. колькасць зямлі і зацягвала перадачу ў казну асобных маёнткаў. Рэшткі царк. уладанняў секулярызаваны ў выніку Кастр. рэвалюцыі 1917.

2) Працэс выхаду з-пад уплыву рэлігіі і царквы розных сфер грамадскага жыцця (палітыкі, права, культуры, асветы, нац. і сямейна-быт. адносін); адзін з аспектаў агульнага працэсу мадэрнізацыі, звязанага з развіццём навукі і вытв-сці, урбанізацыяй. Адбываецца на ўзроўні індывідуальнай свядомасці, сац. ін-таў і прыводзіць да аслаблення б. грамадскіх сувязей і традыцый. Характарызуецца стратай рэлігіяй ролі адзінай крыніцы каштоўнасцей, ідэалаў і норм, манаполіі на тлумачэнне аб'ектыўнай рэальнасці, аслабленнем уплыву царквы на асобу і дзяржаву. Рысы С. выявіліся ў сярэдневякоўі, асабліва праявіліся ў эпоху Адраджэння, Рэфармацыі, бурж. рэвалюцый. У СССР працэс С. найб. інтэнсіўна працякаў у 1920—30-я г. і звязаны з палітыкай дзяржавы, накіраванай на аддучэнне царквы ад жыцця грамадства. У адпаведнасці з дэкрэтам СНК РСФСР (1918) і пастановай СНК БССР (1922) «Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы» былі адменены ўсе ранейшыя прывілеі царквы, маёмасць царквы і рэліг. т-ваў абвешчана агульнанароднай, рэліг. арг-цыям забаронена адкрываць ці мець агульнаадук. школы, выкладаць у школах рэліг. вучэнні. З боку дзяржавы вялася актыўная барацьба з рэлігіяй: храмы зачынялі і разбуралі, духавенства цяркпела ганенні, царква і рэлігія абвяшчаліся «перажыткам старога». Пэўнае ажыўленне рэліг. жыцця назіралася ў перыяд Вял. Айч. вайны ў сувязі з падтрымкай з боку правасл. і рымска-каталіцкага духавенства барацьбы сав. народа супраць ням.-фаш. акупантаў. У 1990-я г. ў постсав. краінах тэмпы С. істотна знізіліся: рэлігія стала адным з элементаў духоўнай культуры, павялічылася колькасць храмаў, рэліг. арг-цыі сталі ўдзельнікамі міратворчай і дабрачыннай грамадскай дзейнасці. У канцы 20 — пач. 21 ст. працэс С. развіваецца адначасова з працэсам *сакралізацыі* розных сфер грамадскага жыцця і захоўваннем рэлігіі і царквы як сродкаў падтрымання духоўнасці і захавання традыц. грамадскіх структур.

Літ.: Яблоков И.Н. Социология религии. М., 1979; Зинченко А.Л. Реформа государственной деревни и секуляризация церковного землевладения в западных губерниях Российской империи // Исторические записки. М., 1985. Т. 112; Кублицкая Е.А. Методологические аспекты изучения особенностей секуляризации в условиях перестройки // Проблемы перестройки: социал. аспект. М., 1989; Сосно В.А. Конфискации церковных имений на Беларуси при включении ее в состав Российской империи // Наш радавод. Гродна, 1992. Кн. 4, ч. 3; Яго ж. Секуляризация церковных крестьян на Беларуси в 30—40-е гг. XIX в. // Церковь в истории славянских народов. М., 1997.

І.В.Катляроў, У.А.Сосна.

СЕ́КУН Віталь Іванавіч (н. 21.11.1935, г. Чарнігаў, Украіна), бел. псіхолаг і сацыёлаг. Д-р псіхал. н. (1989). Скончыў Чалябінскі пед. ін-т (1957) і Ленінградскі ун-т (1966). З 1971 у Ін-це тэхн. кібернетыкі АН Беларусі. З 1981 у Ін-це філасофіі і права АН Беларусі. З 1990 заг. аддзела Ін-та сацыялогіі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па псіхалогіі асобы, праблемах псіхічнай рэгуляцыі дзейнасці і паводзін чалавека, механізмаў фарміравання свядомасці, псіхалогіі кіравання, ментальных працэсаў у грамадстве. Распрацаваў тэорыю першасных і другасных (дзейна апасродкаваных) рыс асобы і іх ролі ў рэгуляцыі паводзін чалавека, канцэпцыю актыўнасці асобы і яе асн. форм.

Тв.: Индивидуально-психологические особенности и взаимоотношения студентов: (Опыт социал.-психол. исслед.) Мн., 1976; Психология активности. Мн., 1996; Понимание морально-психологического состояния офицерским составом Вооруженных Сил. Ч. 1—2. Мн., 1999 (разам з А.М.Гурам); Особенности понимания демократии офицерским корпусом (разам з Л.Мальцавым) // Бел. думка. 2001. № 10.

СЕКУ́НДА ў музыцы, гл. ў арт. *Інтэрвал.*

СЕКУ́НДА (ад лац. secunda divisio другое дзяленне — спачатку градуса, а потым і гадзіны), 1) адзінка часу, адна з асноўных адзінак *Міжнароднай сістэмы адзінак* (СІ). Абазначаецца с. Адрозніваюць атамную (эталонную) і эфемерыдную (астранамічную) С. Атамная С. роўная 9 192 631 770 перыядам эл.-магн. выпрамянення, якое адпавядае пераходу паміж двума звыштонкімі ўзроўнямі асн. стану атама цэзію-133. Узнаўляецца з дапамогай цэзіевых эталонаў частаты і часу (гл. *Квантавыя стандарты частаты*). Эфемерыдная С. роўная $^1/_{31\ 556\ 925,\ 9747}$ долі трапічнага года (1900-га, які пачаўся ў 12 гадз 31.12.1899; гл. *Эфемерыдны час*). 2) Вуглавая С. — пазасістэмная адзінка плоскага *вугла*. Абазначаецца ″. Роўная $^1/_{60}$ *мінуты*, або $^1/_{3600}$ *градуса*, або $^\pi/_{648\ 000}$ рад (гл. *Радыян*).

СЕКУНДАМЕ́Р, прылада для вымярэння прамежкаў часу ў гадзінах, мінутах, секундах і долях секунды. Як і *гадзіннікі*, маюць механізм для адліку часу, а таксама прыстасаванне для пуску, спынення і вяртання да нуля стрэлак (лічбаў).

Першыя С. (з'явіліся ў канцы 19 ст.) мелі толькі секундную стрэлку (адсюль іх назва). Бываюць малагабарытныя — кішэнныя і наручныя (пераважна мех., са стрэлачнай індыкацыяй) і буйнагабарытныя — настольныя, шчытавыя, у т.л. дэманстрацыйныя (звычайна эл., электронна-мех. і электронныя з лічбавай індыкацыяй); падсумоўвальнага дзеяння (паказваюць выніковы час якіх-н. паслядоўных працэсаў), 2-стрэлачныя, шматцыферблатныя, са шкалой для вызначэння колькасці падзей за адзінку часу (напр., удараў пульсу за мінуту) і інш. Выкарыстоўваюцца ў спорце, медыцыне, авіяцыі, прам-сці і інш.

СЕ́КЦЫЯ (ад лац. sectio разразанне, раздзяленне), 1) аддзел установы, арганізацыі і пад. з пэўнай спецыялізацыяй. Напр., С. літаратуры, С. спартыўная, С. абутку ва універмагу. 2) Група ўдзельнікаў з'езда, канферэнцыі, нарады, якая працуе над пэўным колам пытанняў. 3) У тэхніцы — частка якой-н. канструкцыі, машыны (напр., С. эл. шпуль, С. катла). 4) У архітэктуры — закончаная ячэйка жылога дома ці прамысл. будынка.

СЕ́КЦЫЯ ў медыцыне, даследаванне цела памерлага для выяўлення паталаг. змен і ўстанаўлення прычын смерці.

СЕ́ЛА (Cela) Каміла Хасэ (н. 11.5.1916, г. Падрон, Іспанія), іспанскі пісьменнік. Чл. Іісп. АН (з 1957). Вывучаў права ў Мадрыдзе і Англіі. Першыя вершы напісаў пад уплывам Р.*Альберці* і П.*Нэруды*. Паклаў пачатак т.зв. л-ры трэмендызму (ад іісп. tremendo — жахлівы, страшны). У раманах «Сям'я Паскуаля Дуартэ» (1942), «Вулей» (1951) матывы бязвыхаднасці і абсурднасці жыцця. Яго творчай манеры ўласцівы гратэск і іронія, імкненне да прастаты і прымітывізму. Аўтар раманаў «Служба цемры 5» (1973), «Спіс раганосцаў» (1976), «Мазурка для памерлых» (1983), кніг нарысаў, апавяданняў, дарожных нататак. Нобелеўская прэмія 1989.

Тв.: Рус. пер. — Апельсины — зимние плоды. М., 1965; Семья Паскуаля Дуарте. Улей; Повести и рассказы. М., 1980.

Літ.: Тертерян И. Современный испанский роман (1939—1969). М., 1972.

СЕЛАГІНЕ́ЛА (Selaginella), род спаравых раслін сям. селагінелавых. Каля 700 відаў. Пашыраны ўсюды. Большасць С. трапляецца ў вільготных трапічных лясах, здольныя доўгі час знаходзіцца ў цемнаце і вадзе. У пустынных С. у час засухі лісце і парасткі скручваюцца і расліна ўпадае ў крыптабіёз (пры ўвільгатненні — ажывае). На Беларусі культывуюць у аранжарэях і пакоях.



Секундамеры: 1 — механічны кішэнны; 2 — механічны падсумавальнага дзеяння з дзвюма секундамі стрэлкамі і трыма шкаламі; 3 — электрычны дэманстрацыйны з дзвюма шкаламі.

Шматгадовыя дзераза- або мохападобныя травяністыя расліны ад далікатных дзярнінных форм выш. 5—10 см да лазячых і павойных з даўж. сцябла да некалькіх метраў. На парастках 2 рады дробнага спіннога лісця і 2 рады больш буйнога бакавога. Размнажаюцца спорамі і вегетатыўна. *А.М.Скуратовіч.*

СЕ́ЛАМ, Салем, горад на Пд Індыі ў перадгор'ях Усх. Гат, у штаце Тамілнад. Каля 700 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: чорная і каляровая металургія, шаўковая, баваўняная, хім., металаапрацоўчая. Цэнтр здабычы баксітаў і магнезіту. Цэнтр гандлю чаем. Паблізу С. чайныя плантацыі. Філіял Мадраскага ун-та.

СЕЛ-А́НЯ (літаральна — маці ветру), у венгерскай міфалогіі гаспадыня ветру. Паводле аднаго з варыянтаў міфа, вецер дзьме з дзіркі, што знаходзіцца ў вял. гары недзе за сямю гарамі, а С.-А. сцеражэ гэтую дзірку. Паводле інш. уяўленняў, жытло С.-А. знаходзіцца сярод галін сусв. дрэва, ад руху якіх і ўсчынаецца вецер.

СЕЛЕ́КТАР (лац. selector сарціроўшчык), электронная ці электрамех. прылада для прыёму выкліку абанента ў *селектарнай сувязі*. Ланцуг выкліку ў

Селагінела: 1 — сібірская; 2 — Мартэнса; 3 — кручкаватая; 4 — тамарыскалістая.

С. замыкаецца, калі з цэнтр. пульта дасылаецца ў С. пэўная камбінацыя імпульсаў току.

СЕЛЕ́КТАРНАЯ СУ́ВЯЗЬ, выбіральная тэлефонная сувязь, сістэма аператыўнай тэлеф. сувязі пунктаў (абанентаў) з цэнтр. пунктам і паміж сабой пры паралельным уключэнні вял. колькасці тэлеф. апаратаў у агульную лінію сувязі. Кожны апарат сістэмы С.с. мае прыладу выкліку (*селектар*) для перагавораў з 1 абанентам, іх групай ці ўсімі абанентамі адначасова. Выкарыстоўваецца на чыг. і рачным транспарце, у энергасістэмах, на шахтах, а таксама, калі абаненцкія пункты магчыма размясціць уздоўж адной тэлеф. лініі вял. працягласці.

СЕЛЕКТЫ́ЎНАСЦЬ РАДЫЁПРЫЁМНІКА, выбіральнасць радыёпрыёмніка, здольнасць радыёпрыёмнага апарата з мноства сігналаў, якія нясуць розную інфармацыю, вылучаць патрэбныя сігналы ці рэагаваць толькі на сігналы з папярэдне зададзенымі параметрамі; параметр *радыёпрыёмніка*, які колькасна характарызуе такую здольнасць.

СЕЛЕ́КЦЫЯ (ад лац. selecto адбор), навука і комплекс практычных мерапрыемстваў па стварэнні і паляпшэнні парод жывёл, сартоў раслін і штамаў мікраарганізмаў; адна з форм *эвалюцыі* жывых арганізмаў. Падпарадкоўваецца тым жа законам, што і эвалюцыя відаў у прыродзе, але *натуральны адбор* заменены *штучным адборам*. Тэарэт. аснова С. — *генетыка*. Асн. метады — *адбор* лепшых *фенатыпаў* (масавы адбор) або лепшых *генатыпаў* (індывідуальны адбор), *гібрыдызацыя* з выкарыстаннем *гетэрозісу* і цытаплазматычнай мужчынскай стэрыльнасці, *поліплаідыя, мутагенез* і інш. Этапы селекцыйнага працэсу: абгрунтаванне мэт і задач, стварэнне ці падбор зыходнага матэрыялу, распрацоўка схемы, правядзенне селекцыйных мерапрыемстваў, сорта- ці пародавыпрабаванне. С. праводзяць па якасці (смак, знешні выгляд, лёжкасць пладоў, колькасць бялкоў і амінакіслот у зерні, тлушчамалочнасць і інш.); устойлівасць да хвароб, шкоднікаў і неспрыяльных умоў асяроддзя; урадлівасць у раслін, плоднасць і прадукцыйнасць у жывёл і інш.

Несвядомы адбор «на племя» ўзнік у часы прымітыўнага земляробства, у выніку якога створаны шматлікія стараж., «мясц.» пароды і сарты. У выніку свядомай масавай С. некалькі стагоддзяў назад узніклі вядомыя сарты пшаніцы (Крымка, Белатурка, Палтаўка), сланечніку (Зялёнка, Фуксінка), лёну (Смаленскі, Пскоўскі), канюшыны (Пермскі), яблыні (Антонаўка, Грушаўка), пароды авечак (каракульская і раманаўская), коней (арабская, ахалтэкінская), буйн. раг. жывёлы (малочныя яраслаўская і халмагорская, шэрая ўкраінская) і інш. У канцы 18 — пач. 19 ст. ўзнікла т.зв. прамысл. С. У Вялікабрытаніі створаны селекцыйныя гадавальнікі, арганізавана *племянная жывёлагадоўля*, заведзены *племянныя кнігі*. Праводзіліся працы па стварэнні лейстэрскай пароды авечак, шортгорнскай пароды буйн. раг. жывёлы. Сталі вядомы сарты пшаніцы англ. селекцыянераў П.Шырэфа, Ф.Галета, ням. В.Рымпаў і інш. Узнікненне навук. С. звязана з эвалюцыйным вучэннем Ч.Дарвіна (гл. *Дарвінізм*). Высновай для распрацоўкі тэорыі С. з'явіліся працы дацкага генетыка В.Іагансена, швед. селекцыянера Г.Нільсана-Эле; па хім. і радыяцыйным мутагенезе — сав. генетыкаў У.У.*Сахарава*, М.М.Мейселя, англ. Ш.Аўэрбаха; па эвалюц. генетыцы — сав. вучонага С.С.*Чацверыкова*, амер. С.Райта, англ. Дж.Б.С.*Холдэйна*. Гл. таксама *Селекцыя раслін*.

СЕЛЕ́КЦЫЯ РАСЛІ́Н, тэорыя і практыка стварэння і паляпшэння сартоў і гібрыдаў раслін. Распрацоўвае спосабы ўздзеяння на расліны з мэтай змянення іх спадчынных якасцей у патрэбным кірунку. Звязана з сістэматыкай, марфалогіяй, фізіялогіяй, біяхіміяй раслін і інш. Тэарэт. аснова С.р. — *генетыка* раслін. Асн. метады С.р.: *адбор, гібрыдызацыя, мутагенез, поліплаідыя*. Перспектыўны кірунак С.р. — сінтэтычная С.р., заснавана на выкарыстанні з'явы *трансгрэсіі* (больш моцнае развіццё станоўчых якасцей у патомкаў у параўнанні з бацькоўскімі формамі) у гібрыдаў, што атрыманы скрыжаваннем некалькіх сартоў ці форм. На Беларусі навук. працы па С.р. вядуцца з канца 19 ст. (М.В.Рытаў, А.Семпалоўскі, К.Бяляўскі); планамерныя даследаванні — з 1920-х г. у Бел. аддзяленні Усесаюзнага ін-та раслінаводства, на Бел. с.-г. доследнай станцыі паляводства і інш. Да 1941 створаны бел. сарты і сабраны селекцыйны матэрыял палявых, агароднінных, пладовых і ягадных культур. Праблемамі С.р. займаюцца НДІ генетыкі і цыталогіі, аховы раслін і інш. Нац. агр. АН Беларусі, земляробства і кармоў, бульбаводства, гароднінаводства, пладаводства і інш. Нац. АН Беларусі. Створаны: сарты і гібрыды бульбы, капусты, якія спалучаюць прадукцыйнасць, хваробаўстойлівасць і макс. назапашванне пажыўных рэчываў; нізкарослыя і высокапрадукцыйныя сарты збожжавых культур; скараспелыя кукурузы; лёну і лубіну, устойлівыя да фузарыёзу і інш. Найб. вядомыя сарты бел. С.р.: азімага жыта — Спадчына, Завея-2, Дружба, Белта; ячменю — Жодзінскі-5, Крынічны, Прыма Беларусі, Візіт, Верас, Гонар; трыцікале — Дар Беларусі, Міхась, Мара, Лана; аўса — Вандроўнік; бульбы — Лазурыт, Явар, Скарб, Архідэя, Арбіта, Ласунак, Беларускі-3; лёну — Аршанскі-2; яблыні — Алеся, Антэй і інш. Шматлікія сарты бел. С.р. унесены ў нац. рэестры Расіі, Украіны, краін Балтыі. *З.А.Казлоўская.*

СЕЛЕ́Н (лац. Selenium), Se, хімічны элемент VI групы перыяд. сістэмы; ат. н. 34; ат. м. 78,96. Прыродны С. складаецца з 6 стабільных ізатопаў, асн. ^{80}Se (49,82%). З 16 радыеактыўных ізатопаў найб. значэнне мае ^{75}Se з перыядам паўраспаду 121 сут. Вельмі рэдкі і рассеяны элемент, у зямной кары $1{,}4\cdot10^{-6}$% па масе. Здольны да канцэнтрацыі, утварае больш за 50 мінералаў (*селенідаў*, селенітаў, селенатаў і інш.), характэрны прымесі С. ў сульфідах і самароднай серы. Уваходзіць у састаў жывых арганізмаў. Штодзённа чалавеку і жывёлам неабходна 50—100 мкг С. на 1 кг рацыёну. Адкрыты Ё.Я.*Берцэліусам* у 1817 (назва ад грэч. selēnē Месяц).

С. — *неметал*. Мае некалькі алатропных мадыфікацый. Устойлівая крышт. мадыфікацыя — шэры, т.зв. «металічны», С. гексаганальнай структуры; шчыльн. 4800 кг/м^3, $t_{пл}$ 221 °С, $t_{кіп}$ 685 °С. Паўправаднік. На паветры ўстойлівы; кісларод, вада, саляная і разбаўленая серная к-ты на С. не дзейнічаюць, растваецца ў канцэнтраванай азотнай к-це і царскай гарэлцы. З кіслародам утварае аксіды. Усе *селену злучэнні* ядавітыя. Выкарыстоўваецца ў электратэхн., металургічнай, хім., фармацэўтычнай прам-сці.

СЕЛЕ́НА, багіня ў старажытнагрэчаскай міфалогіі, увасабленне Месяца. Лічылася дачкой тытанаў Гіперыёна і Тэі, сястрой бога сонца *Геліяса* і багіні ранішняй зары Эас. С. атаясамлівалі з *Артэмідай*, часам і з *Гекатай*, якая лічылася апякункай чарадзейства і варажбы; лічылася, што чараўніцкія маніпуляцыі найб. дзейсныя пры поўным ззянні Месяца — С. У рым. міфалогіі С. адпавядала *Дыяна*.

СЕЛЕНАРГАНІ́ЧНЫЯ ЗЛУЧЭ́ННІ, рэчывы, якія маюць у малекуле сувязь вуглярод — *селен*. Асн. тыпы: селеніды, дыселеніды, селенолы, селеналіксіды, селеноны, селенінавыя і селенонавыя к-ты, селеноніевыя солі, алкіл(арыл)селенгалагеніды, селеністыя гетэрацыклы. Па хім. уласцівасцях аналагічныя *серарганічным злучэнням*, але больш рэакцыйназдольныя (напр., селенонавыя к-ты — моцныя акісляльнікі). Маюць высокую біял. актыўнасць, паскараюць метабалічныя працэсы ў арганізме (напр., 6-селенапурын выкарыстоўваецца пры дыягностыцы пухлінных захворванняў, селенацыстын аказвае антывіруснае ўздзеянне). На аснове С.з. атрымліваюць палімерныя матэрыялы.

СЕЛЕНАВАДАРО́Д, селеністы вадарод, гідрыд селену, бясколерны газ з непрыемным пахам, H_2Se. Шчыльн. вадкага 2120 кг/м^3, $t_{пл}$ - 65,72 °С, $t_{кіп}$ -41,35 °С. На сухім паветры пры хатняй т-ры ўстойлівы; на вільготным паступова акісляецца да *селену*; пры награванні гарыць з утварэннем дыаксіду селену SeO_2. Мала растваральны ў вадзе, раствор мае слабакіслую рэакцыю. Моцны аднаўляльнік. Ядавіты, пашкоджвае слізістыя абалонкі (ГДК 0,2 мг/м^3). Выкарыстоўваецца для атрымання селену высокай чысціні, селенідаў, селенарганічных злучэнняў.

СЕЛЕ́НАВАЯ КІСЛАТА́, цвёрдае крышт. рэчыва, H_2SeO_4. Растваецца ў вадзе, $t_{пл}$ 62,4 °С, вышэй $t_{пл}$ раскладаецца. Па хім. уласцівасцях блізкая да *сернай кіслаты*, але мае большую акісляльную здольнасць, асмольвае арган. рэчывы. Солі С.к. — селенаты, падобныя на *сульфаты*.

СЕЛЕНАЛО́ГІЯ (ад грэч. selēnē Месяц + ... *логія*), раздзел *планеталогіі*, які даследуе будову і хіміка-мінералагічны склад Месяца. Форму і метрычныя характарыстыкі Месяца даследуе с е л е н а д э з і я. С. ўзнікла ў сярэдзіне 20 ст. з пачаткам прамых даследаванняў Месяца пры дапамозе штучных спадарожнікаў Месяца і прыбораў, дастаўленых на яго паверхню касм. станцыямі. Задачы С. — высвятленне працэсаў, што фарміруюць рэльеф месяцавай паверхні, прыроды грунтоў, рэчыўнага саставу і мех. уласцівасцей покрыва, а таксама вывучэнне гісторыі развіцця форм паверхні. Выкарыстоўвае метады астрафізікі, геафізікі, геахіміі, геалогіі (напр., растравую электронную мікраскапію) і інш. Вядуцца наземныя і касм. назіранні аптычных, цеплавых, радыёлакацыйных і інш. характарыстык паверхні, таксама вымярэнні ўласцівасцей месяцовых парод.

СЕЛЕНГА́, рака ў Манголіі і Расіі (Бураціі). Утвараецца ад сутокаў рэк Ідэр і Мурэн. Даўж. (ад вытоку р. Мурэн) 1024 км, у т.л. 409 км у межах Расіі, пл. бас. 447 тыс. км^2, у т.л. 148 км у межах Расіі. Цячэ пераважна па нізкагор'ях і хвалістых раўнінах, упадае ў воз. Байкал, утварае дэльту (пл. 680 км^2). Асн. прытокі: Эгійн-Гол, Джыда (злева), Архон, Чыкой, Хілок, Уда (справа). Нізкае веснавое разводдзе, летне-асеннія дажджавыя паводкі. Сярэдні расход вады больш за 900 м^3/с. На С. прыпадае каля палавіны аб'ёму сумарнага гадавога сцёку рэк, якія ўпадаюць у воз. Байкал. Ледастаў ад ліст. да красавіка. Суднаходная. У бас. С. больш за 5,5 тыс. азёр агульнай пл. 616 км^2. На С. — г. Улан-Удэ.

СЕЛЕНІ́ДЫ, злучэнні *селену* з менш электраадмоўнымі элементамі. Вядомыя для металаў і неметалаў. Крышт. рэчывы часта з метал. бляскам. Па хім. уласцівасцях блізкія да *сульфідаў* і *тэлурыдаў*. Маюць паўправадніковую або метал. эл. праводнасць. Выкарыстоўваюць у фотарэзістарах і фотаэлементах (С. цынку, кадмію, ртуці), у лазерах (С. галію), як кампаненты сухіх антыфрыкцыйных змазак пры ўмовах высокага вакууму (напр., у касм. апаратах) і цвёрдых змазак вузлоў трэння машын, каталізатары ў арган. сінтэзе (С. малібдэну, вальфраму, ніобію), пігменты для фарбаў (С. кадмію). Гл. таксама *Селенарганічныя злучэнні*.

СЕЛЕНІ́Т (ад грэч. selēnē Месяц), с а ц і н а в ы ш п а т, мінерал, структурная разнавіднасць *гіпсу*. Тонкавалакністыя крышталі ўтвараюць субпаралельныя агрэгаты, якія запаўняюць трэшчыны ў мергелістых пясчаніках; валокны С. перпендыкулярныя сценкам трэшчын. Колер мядовы, ружова-жоўты, крэмавы, зменлівы ўздоўж валокнаў. Бляск шаўкавісты, узмацняецца пры паліроўцы, абумоўлівае з'яву светлавога «месяцавага» водбліску. Цв. 2. Вырабны камень. Буйное радовішча на Урале (Расія).

СЕЛЕ́НУ ЗЛУЧЭ́ННІ, хімічныя злучэнні, у састаў якіх уваходзіць *селен*. Найб. пашыраны *селенавадарод* H_2Se і яго солі — *селеніды*. Пры спальванні селену ў паветры ўтвараецца аксід селену SeO_2, які з'яўляецца ангідрыдам селеністай к-ты H_2SeO_3. Пад уздзеяннем моцных акісляльнікаў, у прысутнасці вады селеністы ангідрыд пераходзіць у *селенавую кіслату* H_2SeO_4, солі якой (селенаты) па хім. уласцівасцях аналагічныя *сульфатам*. Выкарыстоўваюцца С.з. ў арган. сінтэзе, электратэхн., хім., металургічнай, фармацэўтычнай прам-сцях. Гл. таксама *Селенарганічныя злучэнні*.

СЕ́ЛЕРС, С е л а р с (Sellars) Рой Вуд (9.7.1880, г. Эгмандвіл, Канада — 5.9.1973), амерыканскі філосаф, адзін з заснавальнікаў *крытычнага рэалізму*. Праф. Мічыганскага ун-та (1905—50). Распрацаваў тэорыю ўзроўняў стварэння прыроды, паводле якой з'яўленне якасна новага звязана з пераходам з ніжэйшага на больш высокі ўзровень развіцця. У этыцы адстойваў канкрэтна-гіст. і сацыяльна абумоўлены характар маральных ацэнак і духоўных каштоўнасцей. Палемізаваў з ідэаліст. філас. кірункамі, крытыкаваў тэорыю псіхафізіял. дуалізму, тэалогію і рэліг. догматы. Гал. творы: «Крытычны рэалізм» (1916), «Эвалюцыйны натуралізм» (1922), «Прынцыпы і праблемы філасофіі» (1926), «Філасофія фізічнага рэалізму» (1932) і інш.

СЕЛЕТЫТЭНІ́З, бяссцёкавае горка-салёнае возера на мяжы Какчэтаўскай і Паўладарскай абл. Казахстана. Сярэдняя пл. 777 м^2 (пл. зменьваецца). Глыб. да 3,2 м. Размешчана на дне ўпадзіны на выш. 64 м. Упадаюць рэкі Шалаксай і Селеты (губляецца ў саланчаковых балотах, дасягае С. у разводдзе).

СЕЛЕ́ЎК І НІКА́ТАР (грэч. Seleukos Nikatōr «Пераможца», каля 358—281 або 280 да н.э.), заснавальнік дынастыі *Селеўкідаў* і *Селеўкідаў дзяржавы*. Палкаводзец *Аляксандра Македонскага*, пасля смерці якога атрымаў (у 321) пад уладу сатрапію Вавілонія, дзе замацаваўся ў 312 (312 да н.э. — пачатак т. зв. селеўкідскай эры). У выніку барацьбы з інш. *дыядохамі*, далучыў да сваіх уладанняў Мідыю, Сузіяну, Персіду, пазней Бактрыю; у 305 абвясціў сябе царом. Выйграў бітву пры Іпсе (301) і захапіў Месапатамію і Сірыю; пасля перамогі над *Лісімахам* пры Курупедыі (Карупедыён) заняў амаль усю М. Азію. Для заваявання Фракіі і Македоніі С. з войскамі пераправіўся цераз Гелеспонт (Дарданелы), але быў забіты.

Селеніт.

СЕЛЕЎКІ́ДАЎ ДЗЯРЖА́ВА, найбуйнейшая эліністычная дзяржава, якая існавала ў 312—64 да н.э. на Блізкім і Сярэднім Усходзе. Часам яе наз. паводле асн. тэр. Сірыйскім царствам. Засн. пасля распаду імперыі *Аляксандра Македонскага* адным з яго палкаводцаў *Селеўкам I Нікатарам*. Сталіцы — Селеўкія на р. Тыгр (да 300 да н.э.), потым — Антыёхія на р. Аронт. Найб. магутнасці дасягнула пры *Антыёху III* Вялікім (223—187 да н.э.), калі ўключала Сірыю, Месапатамію, частку М. Азіі, Іранскае нагор'е, частку Сярэдняй Азіі. Да С.дз. ў гэты час былі далучаны Келесірыя, Фінікія, Палесціна. Зручнае геагр. становішча С.дз. спрыяла росквіту земляробства, жывёлагадоўлі, гандлю, росту гарадоў. З 2 ст. да н.э. С.дз., аслабленая шэрагам паўстанняў і ўнутр. разладам (з 163 па 64 да н.э. змянілася 19 цароў), пачала страчваць свае ўладанні. У 64 да н.э. апошняя яе частка (Сірыя) стала рым. правінцыяй.

СЕЛЕЎКІ́ДЫ, царская дынастыя, якая кіравала ў 312—64 да н.э. ў адной з эліністычных дзяржаў у Зах. Азіі (гл. *Элінізм* і *Селеўкідаў дзяржава*). Заснавана *Селеўкам I Нікатарам*. Найб. магутнасці дасягнула пры *Антыёху III* Вялікім [223—187 да н.э.].

СЕ́ЛЕЦК, вёска ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 40 км на ПдЗ ад г. Мар'іна Горка, 100 км ад Мінска, 40 км ад чыг. ст. Пухавічы, 285 ж., 114 двароў (2001). Лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

СЕЛІВА́НАЎ Панцеляймон Аляксеевіч (н. 25.8.1919, с. Ірта Ленскага р-на Архангельскай вобл., Расія), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1976). Скончыў Ваенна-паліт. акадэмію ў Маскве (1952). З 1939 у Сав. Арміі. У 1960—91 у Ін-це гісторыі АН Беларусі. Даследуе гісторыю Беларусі перыяду грамадз. вайны і інтэрвенцыі (1918—20), ваен. будаўніцтва. Адзін з аўтараў «Гісторыі Мінска» (1967), «Гісторыі Беларускай ССР» (т. 3. 1973), «Гісторыі рабочага класа Беларускай ССР» (т. 2. 1985), кн. «Замежная ваенная інтэрвенцыя ў Беларусі, 1917—1920» (1990).

Тв.: Военное строительство в Белоруссии в период разгрома походов Антанты. Мн., 1973; Военная деятельность Советов Белоруссии, 1917—1920 гг. Мн., 1980; Укрепление тыла Красной Армии: Деятельность Советов и ревкомов Белоруссии (1918—1920 гг.). Мн., 1987.

СЕЛІВО́НІК Васіліса Сямёнаўна (1907, в. Літвінкі Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. — 14.12.1990), удзельніца рэв. руху ў Зах. Беларусі. Чл. Брэсцкага, сакратар Гродзенскага, Слонімскага і Пінскага акр. к-таў КПЗБ. Дэлегат II з'езда КПЗБ (май 1935). У сак. 1936 арыштавана польск. ўладамі і прыгаворана да 10 гадоў турмы. Дэп. Нар. сходу Зах. Беларусі (28—30.10.1939, Беласток). У Вял. Айч. вайну ўдзельніца партыз. барацьбы на тэр. Жабінкаўскага і Брэсцкага р-наў, чл. Жабінкаўскага раённага антыфаш. к-та. Пасля вайны на парт. і сав. рабоце ў Брэсце. Ганаровы грамадзянін г. Брэста (1969). Аўтар успамінаў. *М.П.Клімец.*

СЕЛІГЕ́Р, возера ў Цвярской і Наўгародскай абл. Расіі, на Валдайскім узв., на выш. 205 м. Пл. 212 км^2. Сярэдняя глыб. 5,8 м, найб. 24 м, выцягнута з Пн на Пд 66 км, з З на У 37 км. Катлавіна ледавіковага паходжання. Мае складаную лопасцевую форму. Складзена з некалькіх адасобленых плёсаў, злучаных кароткімі пратокамі. 169 астравоў, найб. Хочын (31 км^2). Берагі моцна парэзаныя. Прымае 110 прытокаў (асн. — рэкі Чаромуха, Крапівенга, Сароча), сцёк у р. Селіжараўка (левы прыток р. Волга). Ледастаў ад ліст. да красавіка. Рыбалоўства. На С. — г. Асташкаў. Раён турызму і адпачынку.

СЕ́ЛІГМЕН (Seligman) Бен Барух (20.11.1912, г. Ньюарк, ЗША — 1970), амерыканскі вучоны-эканаміст. Скончыў Бруклінскі каледж (1934), ступень магістра атрымаў у Калумбійскім ун-це (1936). У 1941—45 працаваў ва ўрадавых установах ЗША, выкладаў у Бруклінскім каледжы (1947—49). У 1950—60-я г. эканам. эксперт шэрагу прафс. арг-цый ЗША. З 1965 праф. эканомікі і дырэктар даследчага цэнтра па праблемах прац. адносін Масачусецкага ун-та. Аўтар манаграфій па пытаннях працы, цэн, гісторыі эканам. вучэнняў, навук. працы па розных аспектах сац. адносін у сучасным грамадстве — праблемах беднасці, уплывах аўтаматызацыі і інш.

Тв.: Рус. пер. — Основные течения современной экономической мысли. М., 1968; Сильные мира сего: бизнес и бизнесмены в американской истории. М., 1976.

СЕЛІ́М III (Selim III; 24.12.1761, Стамбул — 28.7.1808), турэцкі султан [1789—1807]. Набыў вядомасць спробамі рэфармаваць Асманскую імперыю. Па яго даручэнні была намечана і часткова ажыццёўлена праграма пераўтварэнняў у ваен., эканам. і фін. сферах на еўрап. ўзор (нізам- і джэдзід). Сутыкнуўшыся з моцным супраціўленнем кансерватыўных колаў, ён быў вымушаны скасаваць рэформы. 29.5.1807 скінуты *янычарамі* і праз год забіты.

СЕЛІМА́Н (Selimand) Францыа (?—1800), французскі майстар-ткач залататканых паясоў. Запрошаны А.Тызенгаўзам з Ліёна на Гродзенскую персіярню ў 1774, якой кіраваў да 1778, на гэты час прыпадае росквіт персіярні. Стварыў новы тып пояса, дзе, не парушаючы велічыні, падзелу і арнаментальнай структуры *слуцкага пояса*, удала спалучыў традыц. ўсх. арнамент і ўзоры франц. арнаменту 18 ст. Паясы С. адметныя гарманічнасцю кампазіцыі, лёгкасцю малюнка, вытанчанасцю каларыту. Працаваў таксама ў Кабылцы пад Варшавай (да 1787), з 1794 у Корцу на Валыні ў кн. Чартарыйскіх. На многіх паясах работы С. ёсць метка «F.S.». *Дз.С.Трызна.*

Возера **Селігер**.

СЕЛІ́Н (Céline; сапр. Д э т у ш; Destouches) Луі Фердынанд (27.5.1894, г. Анжэр, Францыя — 2.7.1961), французскі пісьменнік. Па адукацыі ўрач. Вядомасць набыў раманамі «Падарожжа на край ночы» (1932) і «Смерць у крэдыт» (1936), у якіх у форме канкрэтна-апісальнай «плыні свядомасці» адлюстраваў страх і жах тагачаснага існавання. У памфлетах 1936—41, у т.л. «Mea culpa» (лат. «Мая віна», 1936), прапаведаваў нацызм, культ. сілы. У рамане «Марыянеткі» (1944), запісках «Феерыя для іншага выпадку» (1952), аўтабіягр. хроніках «З замка ў замак» (1957) і «Поўнач» (1960) адкрытая да цынізму («лірызм паскуднасці») нянавісць да сучасніка, успрынятае жыццё як спрадвечнай агоніі.

Тв.: Рус. пер. — Путешествие на край ночи. Харьков; М., 1999; Из замка в замок. Харьков; М., 1999; Смерть в кредит. Харьков; М., 1999.

Літ.: Шкунаева И.Д. Современная французская литература. М., 1961.

СЕЛІХА́НАЎ Канстанцін Аляксандравіч (н. 18.8.1967, Мінск), бел. мастак. Скончыў Бел. АМ (1993). Працуе ў станковай скульптуры і графіцы. У скульптуры зазнаў уплыў Г.Мура. Работам уласцівы кампазіцыйная завершанасць, абагульненая акругласць форм, алегарычнасць і метафарычнасць маст. мовы: «Знакі сусвету», «Пара» (абедзве 1990), «Падарожжа», «Коннік» (абедзве 1991), «Тройца» (1992), «Сям'я» (1993), «Дыялог», «Атлант» (абедзве 1996), «Канвентры» (1997), «Дачка Саламона», «Праект» (абедзве 1998), «Вялікі чалавек», «Сям'я» (абедзве 1999), «Сустрэча» (2000).

К.**Селіханаў**. Сустрэча. 2000.

На графіку паўплывала творчасць амер. абстрактных экспрэсіяністаў: серыі «Зносіны» (1995—97), «Ліст» (1996—98), «Праекцыі» (1999—2000), «Сцены», «Героі» (абедзве 2000—01). *С.У.Пешын.*

СЕЛІХА́НАЎ Сяргей Іванавіч (8.3.1917, С.-Пецярбург — 28.9.1976), бел. скульптар. Нар. мастак Беларусі (1963). Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1937). Працаваў у манум. і станковай скульптуры. Манум. творы вызначаюцца выразнай пластыкай, якая дасягаецца свабоднай энергічнай лепкай, яснасцю і дакладнасцю сілуэта, глыбокай змястоўнасцю вобразнага вырашэння: кампазіцыя «Беларусь працоўная» (1950) і фігура Героя Сав. Саюза К.С.Заслонава (1951) для бел. павільёна ВДНГ СССР, партрэты вучонага А.Р.Сталетава для Маск. ун-та і рус. пісьменніка М.Я.Салтыкова-Шчадрына (абодва 1952), гарэльефная кампазіцыя «Савецкая Армія ў гады Вялікай Айчыннай вайны» для *Манумента Перамогі* ў Мінску (1954). Аўтар помнікаў Заслонаву ў г. Орша (1955, арх. Г.Сысоеў), Герою Сав. Саюза М.Казею ў Мінску (1958, арх. В.Волчак), партызанам Л.Чалоўскай у г. Барысаў (1958), І. і М. Цубам каля в. Вялікі Лес Салігорскага р-на (1961, арх. В.Занковіч, Л.Левін), У.І.Леніну ў г. Столін (1980, з В.Палійчуком, арх. Ю.Казакоў), на магіле ахвяр фашызму ў г. Браслаў (пастаўлены ў 1981), скульпт. кампазіцыя «Няскораны чалавек» у мемарыяльным ансамблі *Хатынь* (1969), мемарыяльны комплекс у гонар перамогі сав. народа ў Вял. Айч. вайне ў в. Старыца Капыльскага р-на (1975). У станковай скульптуры псіхалагізмам і дакладнай перадачай характарных рыс вызначаецца галерэя партрэтаў герояў грамадз. вайны Я.Фабрыцыуса (1959), Герояў Сав. Саюза Р.Н.Мачульскага,

І.С.Жыгарава (абодва 1970), А.Ф.Данукалава (1975), У.Е.Лабанка (1976), мастака А.Мазалёва (1956), нар. паэтаў Беларусі Я.Купалы (1959), Я.Коласа (1967) і інш. Станковыя кампазіцыі: «К.Я.Варашылаў на манеўрах» (1940), «Вызваленне» (1948), «Абаронім дзяцей» (1957), «Апошні бой» (1964), «Абаронцы Брэсцкай крэпасці» (1965) і інш.

Літ.: Кавалёў А.Ф. Сяргей Селіханаў. Мн., 1978. *Э.А.Петэрсон.*

С.І.Селіханаў.

С.Селіханаў. Няскораны чалавек. Скульптурная група мемарыяльнага комплексу «Хатынь». 1969.

СЕ́ЛІШЧА, 1) тэрмін, які шырока ўжываецца ў стараж. летапісах у сэнсе сяло, вёска. 2) Археал. тэрмін, які выкарыстоўваецца для абазначэння рэштак стараж. неўмацаванага паселішча. Як правіла, С. не маюць знешніх прыкмет (равоў, валоў). Найчасцей узнікалі на роўных мясцінах каля рэк і азёр. Жытлы звычайна драўляныя, чатырохвугольныя; дамы размяшчаліся радамі; сустракаецца і кучная забудова без бачнага парадку. Некат. С. былі абгароджаны плятнямі. На Беларусі С. вядомы з эпохі бронзавага веку. У раннім жал. веку насельніцтва пераважна жыло на *гарадзішчах* (акрамя Пд). Новая хваля пашырэння С. пачалася з першых стагоддзяў н.э., асабліва ў 4—5 ст. Шмат С. захавалася ад раннефеад. часу (9—13 ст.). На тэр. Беларусі зафіксавана некалькі соцень С. *В.І.Шадыра.*

СЕ́ЛІШЧА, возера ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ушача, за 10 км на З ад г.п. Ушачы. Пл. 0,52 км², даўж. 1,73 км, найб. шыр. 300 м, найб. глыб. 14 м, даўж. берагавой лініі 4,28 км. Пл. вадазбору 76,8 км². Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы выш. 4—8 м, спадзістыя, на ПдЗ і Пн выш. 14—19 м, стромкія, пад лесам і хмызняком, у верхняй ч. пад выганам ці разараныя. Берагі нізкія, на З і Пд забалочаныя, тарфяністыя. Мелкаводная зона вузкая, у глыбакаводнай адзначаны 3 упадзіны глыб. 7,7, 11, 11,5 м. Востраў пл. 0,2 га. Дно да глыб. 1,5 м пясчанае, ніжэй ілістае. Зарастае. Праз возера цячэ р. Альзініца.

СЕ́ЛІШЧА, вёска ў Слуцкім р-не Мінскай вобл., на скрыжаванні аўтадарог Слуцк—Івацэвічы і Слуцк—Капыль. Цэнтр Акцябрскага с/с і калект.-долевай гаспадаркі. За 9 км на З ад горада і чыг. ст. Слуцк, 114 км ад Мінска. 699 ж., 289 двароў (2001). Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў. Магіла ахвяр фашызму.

СЕ́ЛІШЧА, вёска ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., на беразе аднайм. возера. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на З ад г.п. Ушачы, 162 км ад Віцебска, 22 км ад чыг. ст. Зябкі. 319 ж., 135 двароў (2001). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Руіны касцёла св. Веранікі і кляштара бернардзінцаў (1726).

Упамінаецца з 1552 як двор С., уладанне полацкага харунжага Івана Корсака, 23 дымы. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у Рас. імперыі. З 1878 уваходзіла ў Кубліцкую вол. Лепельскага пав. Віцебскай губ., уладанне А.Шырына. У 1886 мястэчка, 110 ж., 17 двароў, вадзяны млын, вінакурны з-д, 2 крамы, карчма. З 1924 у Чарапоўлічынскім с/с Ушацкага р-на Полацкай, з 1935 у Лепельскай акр. У 1926 у С. 298 ж., 36 двароў, у 1941 — 224 ж., 54 двары. У Вял. Айч. вайну акупанты спалілі 3 двары, загубілі 14 жыхароў. З 1954 цэнтр сельсавета. У 1969 — 252 ж., 54 двары.

СЕ́ЛІШЧАЎ Афанасій Мацвеевіч (23.1.1886, с. Волава Арлоўскай вобл., Расія — 6.12.1942), рускі мовазнавец, славіст. Чл.-кар. АН СССР (1929) і Балгарскай АН (1931). Скончыў Казанскі ун-т (1911). Праф. Іркуцкага (1918—20), Казанскага (1920—21), Маскоўскага (з 1921) ун-таў. Асн. працы па гіст. дыялекталогіі македонскай мовы («Нарысы па македонскай дыялекталогіі», 1918; «Македонскія кодзікі 16—18 стст.», 1933, і інш.), рус. дыялекталогіі («Дыялекталагічны нарыс Сібіры», вып. 1, 1921; «Рускія гаворкі Казанскага краю...», 1927, і інш.), балканскім мовазнаўстве. Аўтар прац па параўнальна-гіст. граматыцы слав. моў, анамастыцы, падручнікаў па слав. мовазнаўстве: «Уводзіны ў параўнальную граматыку славянскіх моў» (вып. 1, 1914), «Славянскае мовазнаўства» (т. 1, 1941), «Старославянская мова» (ч. 1—2, 1951—52).

Тв.: Избр. труды. М., 1968.

СЕ́ЛУС (Selous), рэзерват у Танзаніі, у бас. сярэдняга цячэння р. Руфіджы. Засн. ў 1951 для аховы афр. слана. Пл. 5,5 млн. га. Рэльеф тыповы для Зах.-Афрыканскай саванны. Флора прадстаўлена злакамі, акацыямі, баабабамі. Звычайныя афр. (кафскі) буйвал, бегемот, антылопы, зебры і інш.

СЕ́ЛЫ, старажытнабалтыйскі племянны саюз, які займаў да пач. 13 ст. тэр. па левым беразе р. Даўгава, на Пд — сучаснаю Латвію і часткова сумежны раён на ПнУ сучаснай Літвы. Паліт. і ваен. цэнтр С. — умацаванае гарадзішча (з 6 ст. н.э.) і пасад Селпілс на беразе Даўгавы. С. вялі барацьбу з нямецкімі крыжакамі, але ў 1208 трапілі ў залежнасць ад іх. С. ўвайшлі ў склад латышскай народнасці.

СЕЛЬ (ад араб. сайль бурны паток), с і л ь, м у р, гразевы або гразекаменны паток, які раптоўна ўзнікае ў рэчышчы горнай ракі. Найб. характэрны для горных раёнаў з кантынент. кліматам (напр., для гор Сярэдняй Азіі). Характарызуецца рэзкім кароткачасовым (1—3 гадз) пад'ёмам узроўню вады, хвалепадобным рухам і адсутнасцю строгай перыядычнасці. Фарміруецца пры выпадзенні моцных ліўняў, інтэнсіўным раставанні снегу і лёду горных ледавікоў, радзей ад землетрасенняў, вывяржэнняў вулканаў, прарываў азёрных перамычак, у выніку гасп. дзейнасці (напр., пры ўзрыўных работах у гарах). Перадумовай служыць назапашванне вял. колькасці прадуктаў выветрывання на горных схілах, іх значныя нахілы, працяглае ўвільгатненне грунтоў, што змяншае іх трываласць. Могуць прычыняць вял. разбурэнні. Барацьба з С. вядзецца пераважна шляхам замацавання глебавага і расл. покрыва, буд-ва спец. гідратэхн. збудаванняў, у т.л. плацін.

СЕ́ЛЬВА, с е л ь в а с (партуг. selva ад лац. silva лес), вільготныя, перыядычна затапляльныя экватарыяльныя лясы (*гілеі*) у Паўд. Амерыцы, пераважна ў бас. р. Амазонка. Цяжкапраходныя, маюць надзвычай багаты відавы склад (да 200 відаў пальмаў, гевея, какава, фікусы, бамбукі, дыннае дрэва, шмат ліян і інш.).

СЕЛЬДЖУ́КІ, галіна плямён цюркаўагузаў (туркменаў; першапачаткова жылі на Сырдар'і), названая так ад імя іх правадыра Сельджука (10 — пач. 11 ст.), а таксама адна з назваў створанай ім мусульманскай дынастыі *Сельджукі-*

даў. У 1030-я г. атрымалі на васальных умовах ад дзяржавы *Газневідаў* землі ў Харасане, а потым паўсталі супраць Газневідаў і перамаглі іх пры Дандэнакане (1040). У выніку далейшых заваёў у 11 ст. створана *Сельджукская дзяржава*.

СЕЛЬДЖУКІ́ДЫ, султаны цюркскай агузскай дынастыі, якія кіравалі ў шэрагу краін Блізкага і Сярэдняга Усходу ў 11 — пач. 14 ст. ў *Сельджукскай дзяржаве* («Вялікія Сельджукіды», 1038—1157), у Канійскім султанаце (канец 11 — пач. 14 ст.), у Іраку і зах. Іране (іракскія С., 1118—94), у паўн. Сірыі (сірыйскія С., канец 11 — пач. 12 ст.), у Кермане (керманскія С., 1040-я г. — канец 12 ст.). Назва ад імя Сельджука (кіраўніка цюркскага агузскага племені кынык; жыў у 10 — пач. 11 ст.). Найбуйнейшыя прадстаўнікі С. у Сельджукскім султанаце: *Тагрул-бек* [1038—63], Алп-Арслан [1063—1072], *Мелікшах* [1072—92], Санджар [1118—57]; у Канійскім султанаце — Ала-ад-дзін Кей-Кубад [1219—36].

СЕЛЬДЖУ́КСКАЯ ДЗЯРЖА́ВА. Існавала на Блізкім і Сярэднім Усходзе ў 11—12 ст. Засн. качавымі цюркскімі плямёнамі агузаў на чале з родам *Сельджукіда*ў, якія ў пач. 1030-х г. знаходзіліся ў васальнай залежнасці ад Газневідаў. У 1038 яны паўсталі супраць Газневідаў, у 1040 сельджукскі правадыр *Тагрул-бек* разбіў войска газневідскага султана Масуда; да 1043 заваяваны *Харасан*, потым — *Буідаў дзяржава*. У 1055 яго войскі захапілі Багдад, пасля чаго абасідскі халіф Каім надаў правіцелю С.дз. тытул султана. Пры султане Алп-Арслане [1063—72] да С.дз. далучаны Арменія, Сірыя, Палесціна, *Маверанахр*, у 1071 разбіты візант. войскі ў бітве пры Манцыкерце (Маназкерце). Найб. магутнасці С.дз. дасягнула пры султане *Мелік-шаху* [1072—92], візірам (гал. міністрам) якога быў *Нізам-аль-Мульк*. Пры ім да С.дз. далучана б.ч. Малой Азіі, а *Караханідаў дзяржава* прымушана плаціць даніну (1089). Асноваў землеўладання С.дз. была сістэма *ікта* (ваен. лена). Найбольшыя ікты станавіліся асобнымі княствамі, што прывяло да пераўтварэння С.дз. ў аморфнае дзярж. ўтварэнне. У 1077 адасобіўся Румскі султанат (гл. *Канійскі султанат*), пасля смерці Мелік-шаха адзінства С.дз. стала намінальным. Унутрыпаліт. становішча дзяржавы ўскладнялася дзейнасцю секты *ісмаілітаў*. Пасля 1-га крыжовага паходу (1096—99) С.дз. страціла Палесціну, прыбярэжныя тэр. М. Азіі і Сірыі. Султан Санджар [1118—57] пацярпеў паражэнне ад *каракітаяў* (1141), а ў 1153 узяты ў палон балхскімі агузамі. З яго смерцю (1157) С.дз. распалася на асобныя княствы, пасля чаго ў Сярэдняй Азіі і Іране пачалося ўзвышэнне харэзмшахаў. *В.У.Адзярыха.*

СЕЛЬДЭРЭ́ЕВЫЯ, сямейства двухдольных раслін, тое, што *парасонавыя*.

СЕЛЬДЭРЭ́Й (Apium), род кветкавых раслін сям. парасонавых. Каля 20 відаў, якія часам аб'ядноўваюць у 1 від — С. пахучы (A. graveolens) з падвідамі. Пашыраны па ўсіх кантынентах. Вырошчваўся ў стараж. Рыме і Егіпце, у Расіі — з 17 ст. На Беларусі культывуюць разнавіднасці С. пахучага: лісцевы (напр., сорт Кучаравы лісцевы), чаранковы (напр., сорт Залатое пяро) і караняплодны (напр., сорт Яблычны).

Двухгадовыя (у культуры аднагадовыя) травы. У першы год утвараюць разетку лісця выш. 30—50 см, на другі — баразнаватыя, прамыя, галінастыя сцёблы выш. да 150 см. Кветкі дробныя, зеленаватыя, крэмавыя, або белыя ў складаным парасоніку. Плод — сямянка. Лісце і караняплоды багатыя аскарбінавай к-той, карацінам, вітамінамі, мікраэлементамі, эфірным алеем. У кулінарыі С. выкарыстоўваецца ў свежым, вараным і смажаным выглядзе. З насення і лісця атрымліваюць эфірны алей. Лек. расліны.

В.М.Прохараў.

Сельдэрэй пахучы: 1 — караняплодны; 2 — лісцевы; 3 — чаранковы.

СЕ́ЛЬКІН Міхаіл Васілевіч (н. 30.8.1947, г. Ветка Гомельскай вобл.), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1998), праф. (1991). Засл. работнік адукацыі Беларусі (1997). Скончыў Гомельскі ун-т (1969). З 1973 у Гомельскім ун-це (з 1987 дэкан, з 1990 прарэктар). Навук. працы па метадах даследавання структурнай тэорыі груп і інш. алг. сістэм з дапамогай тэорыі класаў Шунка і тэорыі фармацый.

Тв.: О свойствах максимальных подгрупп конечных групп // Исследование нормального и подгруппового строения конечных групп. Мн., 1984; Максимальные подгруппы в теории классов конечных групп. Мн., 1997.

СЕ́ЛЬНІЦКА-КРАСНАПО́ЛЬСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала са жн. 1941 да вер. 1942 у в. Сельнікі і Краснаполле Расонскага р-на Віцебскай вобл. Аб'ядноўвала 10 чал. (кіраўнік С.І.Голубеў), мела сувязь з *Расонскім патрыятычным падполлем*. Падпольшчыкі распаўсюджвалі сярод насельніцтва лістоўкі і зводкі Саўінфармбюро, збіралі зброю, боепрыпасы, стваралі партыз. рэзерв, арганізоўвалі ўцёкі ваеннапалонных з краснапольскага лагера, праводзілі дыверсіі. У маі большасць падпольшчыкаў пайшла ў партызаны. У в. Сельнікі ў гонар падпольшчыкаў пастаўлена стэла.

СЕЛЬРА́Б, Сялянска-рабочае сацыялістычнае аб'яднанне, масавая легальная рэв.-дэмакр. арганізацыя працоўных Зах. Украіны ў 1926—32. Свой уплыў пашырала і на паўд.-зах. частку Зах. Беларусі. Створана па ініцыятыве Кампартыі Зах. Украіны (КПЗУ) у кастр. 1926 на аб'яднаным з'ездзе радыкальных сял. арг-цый «Народная воля» і «Сялянскі саюз» (гл. *Сельсаюз*). С. патрабаваў прадастаўлення зямлі без выкупу, стварэння рабочасял. ўрада, самавызначэння і аб'яднання ўкр. зямель у рэспубліцы рабочых і сялян і інш. Друкаваныя выданні С. — газ. «Сельроб», «Воля народу», «Наше слово», «Нове життя», час. «Вікна» — выкрывалі палітыку ўлад Польшчы ў Зах. Украіне і Зах. Беларусі, прапагандавалі поспехі СССР, абуджалі самасвядомасць працоўных, узнімалі іх на барацьбу супраць сац. і нац. прыгнёту, за ўз'яднанне Зах. Украіны з УССР, а Зах. Беларусі з БССР. Часта выступаў разам з КПЗУ, бел. рэв.-дэмакр. арг-цыямі *Беларуская сялянска-работніцкая грамада* і *«Змаганне»*. За ўплыў на С. ішла вострая барацьба паміж КПЗУ і ўкр.

нац. партыямі. Абвастрэнне ўнутр. рознагалоссяў прывяло ў 1927 да расколу С. на С.-лявіцу і С.-правіцу. У маі 1928 на з'ездзе абедзвюх груп створана аб'яднаная арг-цыя С.-адзінства на платформе рэв. і нац.-вызв. барацьбы. Праз С. КПЗУ і КПЗБ уплывалі на культ.-асв., спарт. і інш. масавыя арг-цыі працоўных. Пярвічныя арг-цыі С. ствараліся ў многіх вёсках і мястэчках паўд.-зах. часткі Зах. Беларусі. У 1926 створаны Брэсцкі акр. к-т С., раённыя к-ты існавалі ў Кобрыне, Высокім, Камянцы, Драгічыне, Іванаве. 2.10.1927 у Брэсце адбыўся мітынг з удзелам 300 прадстаўнікоў С., якія патрабавалі навучання дзяцей на роднай мове і свабоды палітвязням. Улады Польшчы пастаянна праследавалі С. 15.9.1932 абвешчана аб роспуску С., яго актыўныя дзеячы арыштаваны.

СЕЛЬСАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка ў СССР, на Беларусі і ў некат. інш. краінах СНД, састаўная ч. раёна. Падзел на С. ў БССР уведзены пастановай ЦВК БССР ад 7.7.1924, сетка С. зацверджана пастановай ЦВК БССР ад 20.8.1924. На 1.1.1999 у Рэспубліцы Беларусь 1456 С. (гл. таксама *Саветы дэпутатаў*).

СЕЛЬСАЮ́З, Сялянскі саюз, Украінскае сялянскае сацыялістычнае аб'яднанне, легальная рэв.-дэмакр. сялянская арг-цыя, якая дзейнічала ў Зах. Украіне і паўд.-зах. частцы Зах. Беларусі ў 1922—26. Узнікла ў 1922 у час выбараў у польскі сейм на базе выбарчых к-таў, што ствараліся на Палессі, Валыні і Холмшчыне. Утвораны 5.8.1924 на ўстаноўчым з'ездзе ў Брэсце. Друкаваны орган — газ. «Наше життя». Меў уплыў сярод бяднейшага і сярэдняга сялянства. Ставіў за мэту далучэнне іх да рэв.-вызв. руху на аснове рэв.-дэмакр. патрабаванняў. У кастр. 1926 пасля аб'яднання з радыкальнай сял. арг-цыяй «Народная воля» ўвайшоў у склад *Сельраба*.

СЕЛЬСІ́Н (англ. selsyn ад англ. self сам + грэч. synchronos адначасовы), электрычная *пераменнага току машына*, прызначаная для сінхроннага вярчэння вала якога-н. механізма ў адпаведнасці з вуглавым перамяшчэннем інш. вала, механічна не звязанага з першым.



Дыстанцыйная электрычная перадача з сельсінамі — датчыкам і прыёмнікам: $\alpha_д$ — вугал павароту ротара датчыка; $\alpha_п$ — ротара прыёмніка ($\alpha_п \approx \alpha_д$)

Паводле прынцыпу дзеяння з'яўляецца паваротным трансфарматарам, у якога пры вярчэнні ротара адбываецца плаўная змена ўзаемнай індуктыўнасці паміж яго абмоткамі — аднафазнай першаснай (абмоткай узбуджэння) і трохфазнай другаснай (абмоткай сінхранізацыі). Звычайна выкарыстоўваецца сельсінная перадача з С.-датчыка і С.-прыёмніка, якія электрычна звязаны так, што пры павароце ротара С.-датчыка, механічна звязанага з паварочвальным валам, сінфазна і сінхронна з ім паварочваецца ротар С.-прыёмніка. Выкарыстоўваецца ў сістэмах сачэння і дыстанцыйнага вымярэння. *Я.П.Забела.*

СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧАЕ ЗАБРУ́ДЖВАННЕ, забруджванне навакольнага асяроддзя ў выніку с.-г. дзейнасці чалавека; адна са значных праблем *аховы прыроды*, у т.л. водных аб'ектаў. Узнікае пры выкарыстанні *пестыцыдаў, фунгіцыдаў, дэфаліянтаў* (асабліва пры парушэнні тэхналогіі іх захоўвання і выкарыстання); унясенні мінер. угнаенняў у колькасці, большай за неабходную (засваяльную) раслінам (асабліва пры паверхневым сцёку з палёў у вадаёмы); паступленні адходаў і сцёкаў жывёлагадоўчых ферм; эксплуатацыі і абслугоўванні с.-г. тэхнікі і інш. *П.І.Лабанок.*

СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧАЕ МАШЫНАБУДАВА́ННЕ, галіна *машынабудавання і металаапрацоўкі* па вытв-сці с.-г. машын, а таксама агрэгатаў, вузлоў, дэталей, запчастак да іх. Гал. задача С.м. — забеспячэнне комплекснай механізацыі с.-г. вытв-сці. Узнікла ў пач. 19 ст. ў Вялікабрытаніі, потым у ЗША, да канца 19 ст. С.м. мела Францыя, Германія, Швецыя. У Расіі прадпрыемствы па вытв-сці с.-г. інвентару з'явіліся таксама ў 19 ст. (гал. чынам рамонтныя майстэрні замежных гандл. фірм). З 2-й пал. 1920-х г. пачаўся выпуск трактарных культыватараў і плугоў, збожжаўборачных камбайнаў і інш.

На Беларусі ў 19 — пач. 20 ст. існавалі невялікія майстэрні па вырабе і дробным рамонце с.-г. інвентару. У 1840-х г. у мяст. Ракаў Мінскага пав. створаны майстэрні па вытв-сці плугоў, веялак, малатарняў, у 1859 пры Горы-Горацкім земляробчым ін-це пабудаваны дзярж. з-д (вырабляў часткі да эксперым. с.-г. машын), у 1901 у Лідзе засн. чыгуналіцейны з-д, які выпускаў с.-г. інвентар. У 1918—30 с.-г. машыны (бульбакапалкі, каранярэзкі, веялкі, плугі, малатарні, сячкарні) выраблялiся ў Віцебску (з-д «Чырвоны металіст»), Мінску (з-д «Энергія»), Гомелі (з-д «Рухавік рэвалюцыі»). У 1930 пабудаваны *Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання* («Гомсельмаш»). Пасля Вял. Айч. вайны буйныя прадпрыемствы пабудаваны ў гарадах Магілёў, Бабруйск, Брэст, Ліда, Баранавічы і інш. На 1.1.2001 існуе больш за 60 прадпрыемстваў і вытв-сцей С.м., у т.л. *Брэсцкі завод сельскагаспадарчага машынабудавання*, адкрытае акц. т-ва «Лідсельмаш» (гл. *Лідскі завод сельскагаспадарчых машын*), *Мінскі трактарны завод*. Некат. простыя с.-г. механізмы выпускаюць майстэрні райаграпрамтэхнікі ў Лоеве, Ельску, Рагачове, Жыткавічах, Ашмянах і інш. раённых цэнтрах рэспублікі (пра вытв-сць некат. відаў с.-г. машын гл. ў табліцы). *П.І.Рогач.*

СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧАЕ ПРА́ВА, сукупнасць устаноўленых або санкцыянiраваных дзяржавай прававых і лакальных норм, прынятых ва ўстаноўленым парадку самімі юрыд. асобамі. Вызначае асн. прынцыпы, формы і парадак арг-цыі і дзейнасці с.-г. прадпрыемстваў і аб'яднанняў, рэгулюе іх узаемаадносіны паміж сабой і дзяржавай, з работнікамі с.-г. аграпрамысловых прадпрыемстваў і аб'яднанняў і інш. грамадзянамі ў сувязі з вядзеннем імі сельскай гаспадаркі. Гал. крыніца С.п. — Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Нормы С.п. ёсць таксама ў інш. галінах права (зямельнага, гаспадарчага, працоўнага і інш.). Асн. інстытуты С.п.: прававое становішча с.-г. прадпрыемстваў, вытв. аб'яднанняў у сельскай гаспадарцы; прававы статус работнікаў сельскай гаспадаркі; арганізацыйна-прававыя формы ўнутрыгаспадарчага кіравання с.-г. прадпрыемствамі і аб'яднаннямі; права землеўладання і землекарыстання с.-г. прадпрыемстваў, аб'яднанняў і грамадзян; прававы рэжым маёмасці с.-г. прадпрыемстваў і аб'яднанняў; прававое рэгуляванне арганізацыі, дысцыпліны і аховы працы на с.-г. прадпрыемствах; прававое рэгу-

Вытворчасць некаторых відаў прадукцыі сельскагаспадарчага машынабудавання Беларусі

Віды прадукцыі, тыс. штук	Гады		
	1990	1995	1999
Камбінаваныя агрэгаты	1,2	0,1	0,4
Кормаўборачныя камбайны (у т.л. самаходныя)	9,5	1,1	0,4
	1,1	0,8	0,4
Трактарныя бульбасаджалкі	9,8	0,2	0,08
Бульбаўборачныя машыны	15,4	1,6	1,4
Машыны для ўнясення ў глебу арганічных угнаенняў	32,2	0,5	0,1
Трактарныя культыватары	1,2	1,2	0,5
Трактарныя граблі	1,6	0,3	0,6
Плугі конныя	9,5	0,02	0,1
Бароны зубавыя	249,4	1	1
Цеплагенератары	25,7	0,7	0,3

ляванне аплаты працы ў сельскай гаспадарцы; прававое рэгуляванне вытворча-гаспадарчай і фінансавай дзейнасці с.-г. прадпрыемстваў і аб'яднанняў; дагаворныя адносіны; прававое рэгуляванне сялянскай (фермерскай) гаспадаркі і асабістай падсобнай гаспадаркі ў сельскай мясцовасці; адказнасць за парушэнне с.-г. заканадаўства. *Г.А.Маслыка.*

СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧАЙ РАДЫЯЛО́ГІІ БЕЛАРУ́СКІ НДІ. Засн. ў 1992 у г. Гомель на базе Бел. філіяла Усесаюзнага НДІ с.-г. радыялогіі (з 1986). З 1995 НДІ радыялогіі ў падпарадкаванні Мін-ва па надзвычайных сітуацыях і абароне насельніцтва ад наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Рэспублікі Беларусь. З 1999 Рэсп. н.-д. унітарнае прадпрыемства «Інстытут радыялогіі» Мін-ва па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь.

Асн. кірункі навук. дзейнасці: распрацоўка навук. праблем рэабілітацыі забруджаных радыенуклідамі тэрыторый; даследаванні ў галіне с.-г. радыялогіі і распрацоўка практычных рэкамендацый для аграпрамысл. вытв-сці ва ўмовах радыеактыўнага забруджання тэрыторыі; аналіз ахоўных мерапрыемстваў, якія праводзяцца на забруджаных тэрыторыях, з мэтай аптымізацыі суадносін выдаткаў і дозавых нагрузак на насельніцтва; вывучэнне дынамікі паводзін радыенуклідаў у трафічным ланцугу глеба—расліны—жывёлы—прадукты харчавання; інфарм.-аналіт. забеспячэнне Дзярж. праграмы Рэспублікі Беларусь па мінімізацыі і пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС; інфарм. забеспячэнне грамадскасці пра наступствы катастрофы на ЧАЭС, вынікі рэабілітацыйных і аздараўленчых работ; распрацоўка метадаў радыяцыйнай і экалагічнай бяспекі.

СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧАЯ АРЦЕ́ЛЬ, калектыўная сялянская гаспадарка; добраахвотнае аб'яднанне грамадзян для сумеснай вытв-сці с.-г. прадукцыі. Паводле цывільнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь грунтуецца на членстве яе ўдзельнікаў, якія абавязаны ўнесці свой паявы ўзнос, прымаць асабісты прац. ўдзел у дзейнасці арцелі і несці *субсідыярную адказнасць* па яе абавязацельствах. Прававое становішча С.а., правы і абавязкі іх членаў вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб вытв. кааператывах. Установчым дакументам С.а. з'яўляецца статут, зацверджаны агульным сходам яе членаў. Вышэйшым органам кіравання С.а. з'яўляецца агульны сход, выканаўчымі органамі — праўленне і яго старшыня. Гл. таксама *Калгас.* *Г.А.Маслыка.*

СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧАЯ КЛІМАТАЛО́ГІЯ, гл. ў арт. *Кліматалогія* і *Аграметэаралогія.*

СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧАЯ МЕТЭАРАЛО́ГІЯ, тое, што *аграметэаралогія.*

СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧАЯ ТЭ́ХНІКА, машыны, абсталяванне і прыстасаванні, якія забяспечваюць механізацыю тэхнал. працэсаў у раслінаводстве, жывёлагадоўлі, лясной гаспадарцы і меліярацыі. У розных галінах с.-г. вытв-сці выкарыстоўваюцца разнастайныя энергет., трансп. і пагрузачныя сродкі: *трактары, самаходныя шасі, мотаблокі, дызельныя электрастанцыі, аўтамабілі* агульнага прызначэння і спецыяльныя (у т.л. *седлавыя цягачы, самазвалы, рэфрыжэратары,* аўтамабілі-цыстэрны, -фургоны), *прычэпы, канвееры, транспарцёры* і інш. *транспартныя машыны, пагрузачна-разгрузачныя машыны, аўтакраны* і інш.

Тэхніка раслінаводства ўключае: глебаапрацоўчыя машыны (дыскавыя і зубавыя *бароны, валакушы, каткі палявыя, культыватары, лушчыльнікі, пласкарэзы-глыбакарыхліцелі, плугі, рыхліцелі, фрэзы глебавыя*); машыны для ўнясення ўгнаенняў, сяўбы і пасадкі с.-г. культур, аховы і догляду раслін (*раскідвальнікі* ўгнаенняў, ванны і прынад для барацьбы са шкоднікамі, *сеялкі, расадапасадачныя машыны, апырсквальнікі,* культыватары-раслінасілкавальнікі, *бульбасаджалкі,* акучнікі для *акучвання* раслін); машыны для ўборкі і пасляўборачнай апрацоўкі с.-г. культур (*жняяркі*; бацвінне-, бульба-, бурака-, збожжа-, канопле-, коране-, корма-, кукурузы- і сіласаўборачныя камбайны; гл. адпаведныя арт.; *бульбакапалкі, буракаўборачныя машыны, ільноўборачныя машыны, сенаўборачныя машыны,* у т.л. *саломаскладальнікі, граблі, падборшчыкі, стагакіды; малатарні, зернеачышчальныя машыны, трыеры, сушылкі,* абсталяванне *бульбасартавальных пунктаў* і інш.). Тэхніка жывёлагадоўлі: *кормараздатачныя машыны, здрабняльнікі кармоў, саломасіласарэзкі, загрузчыкі кармоў, раздатчыкі кармоў, кармушкі, даільныя апараты* і *даільныя ўстаноўкі, сепаратары малочныя, стрыгальныя агрэгаты,* аўтапаілкі, абсталяванне *інкубатараў,* кармацэхаў, жывёлагадоўчых ферм і комплексаў, птушкафабрык і інш. Тэхніка лясной гаспадаркі: *лесапасадачныя машыны,* лясныя плугі, сеялкі, канава- і ямакапальнікі; бензаматорныя *ланцуговыя пілы,* машыны і агрэгаты для валкі, пакетавання, *тралёўкі* і інш. *лесанарыхтоўчых работ;* сродкі аўтадарожнага, чыг. і воднага (*лесавозы*) транспарту; абсталяванне першаснай апрацоўкі драўніны (сучкарэзныя, акорачныя і раздзелачныя машыны, станкі і ўстаноўкі, *лесапільныя рамы, штабелявальныя машыны*); *дрэваапрацоўчыя машыны* і інш. Меліярацыйная тэхніка: *меліярацыйныя машыны,* у т.л. *каналакапальнікі,* аднакаўшовыя і траншэйныя *экскаватары, планіроўшчыкі, дрэнажныя машыны, дажджавальныя машыны і ўстаноўкі* і інш.

На Беларусі шматлікія прамысл. прадпрыемствы выпускаюць разнастайную С.т. (гл. *Сельскагаспадарчае машынабудаванне*). *В.М.Кандрацьеў.*

СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧАЯ ЭКАЛО́ГІЯ, тое, што *аграэкалогія.*

СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧЫЯ ЗАБАСТО́ЎКІ 1905—07, барацьба парабкаў і сялян супраць памешчыкаў, за ліквідацыю панскага землеўладання ў час рэвалюцыі 1905—07. Масавай з'явай на вёсцы ў гэты час сталі мітынгі і дэманстрацыі, а найважн. сродкам барацьбы — стачка. На Беларусі ў перыяд рэвалюцыі адбылося 1118 (21,3%) с.-г. забастовак.

СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧЫЯ ПЕ́РАПІСЫ, збор статыстычных звестак пра с.-г. вытв-сць, неабходных для вывучэння працэсаў і з'яў, якія адбываюцца ў *сельскай гаспадарцы.* Могуць ахопліваць асн. элементы с.-г. вытв-сці па краіне ці рэгіёне або пэўны элемент сельскай гаспадаркі (напр., жывёлу, расл. культуры). Ажыццяўляюцца адначасова, па адзінай праграме і метадалогіі. Гл. таксама *Перапісы статыстычныя.*

СЕ́ЛЬСКАЕ БУДАЎНІ́ЦТВА, галіна будаўніцтва па стварэнні новых і рэканструкцыі дзеючых будынкаў і збудаванняў, якія прызначаны для абслугоўвання с.-г. вытв-сці і задавальнення культ.-быт. патрэб сельскага насельніцтва. Уключае: узвядзенне с.-г. вытв. комплексаў, будынкаў, пабудоў (жывёлагадоўчыя фермы, птушкафабрыкі, памяшканні для захоўвання і перапрацоўкі збожжа, буйныя цяплічныя комплексы і інш.); жыллёвае і культ.-быт. буд-ва (жылыя дамы, магазіны, клубы, сталовыя, лазні і інш.); буд-ва прадпрыемстваў па рамонце с.-г. тэхнікі, складоў для мінер. угнаенняў, інж. камунікацый, унутрыгасп. дарог, меліярацыйных работы і г.д.

Да сярэдзіны 1950-х г. С.б. на Беларусі мела сезонны характар, грунтавалася на ручной працы, саматужнай вытв-сці буд. матэрыялаў. У пачатку 1960-х г., з пераводам с.-г. вытв-сці на індустр. аснову, пачалі будаваць буйныя жывёлагадоўчыя комплексы, малочна-таварныя фермы, птушкафабрыкі, камбікармавыя з-ды, базы сельгастэхнікі і інш. Былі створаны Мін-ва сельскага буд-ва і Белміжкалгасбуд. Пачалася карэнная перабудова вёсак. Вырашаўся шэраг праблем, звязаных з іх добраўпарадка-

Віды пабудоў	Гады		
	1990	1995	1999
Жывёлагадоўчыя памяшканні, тыс. месц			
для буйной раг. жывёлы	152,1	16,8	2,7
для свіней	39,5	27,1	15,6
Сховішчы для бульбы, агародніны і фруктаў, тыс. т	86,2	19,9	5
Увод жылля (агульная плошча), м^2: усяго	1312	448	894
У т.л.:			
дзярж. прадпрыемствамі і арганізацыямі	706	132	96
індывід. забудоўшчыкамі	165	218	562
калгасамі	422	80	201

ваннем. Ствараліся новыя пасёлкі, у якіх з улікам асаблівасцей сельскага жыцця будаваліся дамы з усімі камунальнымі выгодамі, комплексы культ.-быт. прадпрыемстваў для сялян. У 1960—90 добраўпарадкаваныя пасёлкі створаны ў калгасах «Прагрэс» Гродзенскага, «Гвардыя» Бераставіцкага, «Новы быт» Мінскага, імя Калініна Нясвіжскага, «Аснежыцкі» Пінскага, імя Кірава Слуцкага р-наў і ў многіх інш. На сучасным этапе С.б. ажыццяўляюць арг-цыі і прадпрыемствы Мін-ва архітэктуры і буд-ва, *Беларускі дзяржаўны канцэрн па будаўніцтве* і *эксплуатацыі меліярацыйных і водагаспадарчых сістэм*, канцэрн «Белпаліўгаз», спец. трэсты «Белэнергабуд», «Белтрансбуд» і інш. Вялікія аб'ёмы буд-ва ў сельскай мясцовасці выконваюць раённыя перасоўныя механізаваныя калоны, буд. кааператывы розных форм уласнасці, у т.л. прыватныя. Больш за 15 праектных арг-цый распрацоўваюць праектную дакументацыю на планіроўку і забудову сельскіх населеных пунктаў, с.-г. вытв. комплексаў і пабудоў, аб'ектаў, культ.-быт. прызначэння. Забеспячэнне ўсяго інвестыцыйнага цыкла праектавання і буд-ва на адпаведнай тэрыторыі выконваюць упраўленні капітальнага буд-ва абл. і раённых выканкомаў. У 1999 інвестыцыі ў асн. капітал у сельскай гаспадарцы склалі каля 40 трыльёнаў руб. Некаторыя паказчыкі С.б. гл. ў табліцы. *П.І.Рогач.*

СЕ́ЛЬСКАЕ НАСЕ́ЛЬНІЦТВА, пастаянныя жыхары *сельскіх паселішчаў*; катэгорыя насельніцтва. У большасці эканамічна развітых краін С.н. складае 15—25% (напр., у Канадзе, ЗША, Францыі, Швецыі, Японіі), да 15% (напр., у Вялікабрытаніі, Ізраілі, Нідэрландах), у Расіі — 27%. На Беларусі паводле перапісу насельніцтва 1999 С.н. складае 31% (3084 тыс. чал.). Колькасць насельніцтва, маладзейшага за працаздольны ўзрост — 20%, пенсіённага ўзросту — 34%. Гл. таксама *Перапіс насельніцтва*. *Дз.М.Кудзелка.*

СЕ́ЛЬСКАЯ АБШЧЫ́НА, гл. ў арт. *Абшчына*.

СЕ́ЛЬСКАЯ АРХІТЭКТУ́РА, праектаванне і буд-ва жылых дамоў, культ.-быт. і вытв. памяшканняў, арг-цыя і добраўпарадкаванне тэрыторыі ў сельскай мясцовасці. Развіццё С.а. залежыць ад сац.-эканам. ўкладу грамадства, нац.-быт. традыцый, прыродна-кліматычных і экалагічных умоў. З часоў сярэдневякоўя на Беларусі гістарычна склаліся гал. тыпы сельскіх паселішчаў — *вёска, слабада, сяло, хутар*. Асн. элемент планіроўкі — сял. *сядзіба*. Асн. тыпам жылля была 4- і 5-сценная *хата* з глінабітнай або драўлянай падлогаю і саламянай страхою. Каля хаты размяшчалі гасп. будынкі (*аборы, адрыны, варыўні, гумны* і інш.). Асн. буд. матэрыялы: дрэва, камень, цэгла, саман. Важная роля ў маст. аздабленні будынкаў належала *разьбе архітэктурнай*. Рысы С.а. мелі таксама культавыя будынкі (капліцы, званіцы і інш.). У 1-й пал. 20 ст. ў сельскім буд-ве пашыраны культ.-быт. (клубы) і вытв. будынкі (жывёлагадоўчыя фермы, збожжасховішчы і інш.), дамы з 2—3 пакоямі і кухняй-сталовай. У Вял. Айч. вайну на Беларусі разбурана і спалена 9200 вёсак. У пасляваен. гады многія з іх адноўлены ці пабудаваны новыя. У 1970-я г. распрацавана комплекснае буд-ва паводле генпланаў, асновай якіх сталі *раённыя планіроўкі*. Тэрыторыя пасёлкаў падзялялася на жылую і вытв. зоны (аддзеленыя сан. ахоўнай зялёнай паласой), звязаныя трансп. і пешаходнымі камунікацыямі. У асобных гаспадарках эксперыментаваліся розныя варыянты і прыёмы арх.-планіровачнай арг-цыі жылых пасёлкаў, вытв. комплексаў, інж. абсталявання, тыпы жылых дамоў, кватэр і аб'ектаў культ.-быт. прызначэння. Паводле эксперым. праектаў забудаваны цэнтр. сядзібы калгасаў і саўгасаў: у вёсках *Верцялішкі* (арх. В.Емяльянаў, Г.Заборскі і інш., Дзярж. прэмія СССР 1971), *Сарачы* (арх. Заборскі), *Сноў* (арх. З.Озерава і інш.), *Малеч* (арх. Н.Нядзелька, У.Сакалоўскі і інш.), Зашыр'е Ельскага р-на Гомельскай вобл. (арх. Емяльянаў, П.Рудзік і інш.), Леніна Горацкага р-на Магілёўскай вобл. (арх. Г.Бяганская, А.Калніньш) і інш. Сельскія пасёлкі маюць арх.-планіровачнае вырашэнне, выгоды і добраўпарадкаванне як *гарадскія пасёлкі*. Жылую забудову складаюць 2—4-павярховыя шматкватэрныя дамы сядзібнага тыпу (пас. *Жамчужны*, вёскі Астрамечава Брэсцкага р-на, в. Мышкавічы Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. і інш.). Значна палепшаны тыпавыя праекты сельскіх жылых дамоў і грамадскіх будынкаў. Паводле індывід. праектаў пабудаваны шэраг клубных будынкаў, прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання, дзіцячых дашкольных устаноў, школьных будынкаў, камбінатаў быт. абслугоўвання і інш. З узбуйненнем гаспадарак, выкарыстаннем разнастайных буд. матэрыялаў, канструкцый, прагрэс. тэхнал. працэсаў, з паляпшэннем умоў с.-г. працы шырока вялося буд-ва аб'ектаў с.-г. прызначэння (жывёлагадоўчыя і птушкагадоўчыя фермы, карпусы кармацэхаў, майстэрні, склады, збожжасховішчы, сянажныя і воданапорныя вежы і інш.), якія арганічна звязаны з архітэктурай населеных месцаў і ландшафтам прыроднага асяроддзя. Узаемасувязь вытв. і сялібнай зон ажыццяўляецца на аснове адзінага маштабу, суразмернага з ландшафтнымі элементамі тэрыторыі. Кантраст верт. вышынных аб'ёмаў (сянажныя і воданапорныя вежы) і гарыз. падоўжаных жывёлагадоўчых будынкаў стварае выразнае арх. аблічча забудовы вытв. зоны (комплекс птушкафабрыкі ў в. Бабінічы Аршанскага р-на Віцебскай вобл.). Чляненне фасадаў сценавымі панэлямі, выкарыстанне стужачнага шклення надаюць будынкам рысы прамысл. збудаванняў. З 1970-х г. узводзілі буйныя жывёлагадоўчыя комплексы з адм.-быт. карпусамі і добраўпарадкаванай тэрыторыяй, ствараліся буйнагабарытныя блакіраваныя памяшканні. У аснове планіроўкі комплексаў — прынцып функцыян. заніравання. Для С.а. 1980-х г. характэрна буд-ва аграпрамысл. комплексаў і аб'яднанняў. Створаны буйныя шматфункцыян. зоны вытв. прызначэння, аналагічныя прамысл. вузлам у га-

Да арт. **Сельская архітэктура**. Комплекс птушкафабрыкі ў вёсцы Бабінічы Аршанскага раёна Віцебскай вобл.

Да арт. **Сельская архітэктура**. Цэнтральная сядзіба калгаса ў вёсцы Сарачы Любанскага раёна Мінскай вобл.

радах з выкарыстаннем разнастайных буд. матэрыялаў (дрэва, прыродны камень, керамічная плітка, шкло, пластмасы і інш.). У 1990-я г. тэмпы жыллёвага буд-ва на вёсцы значна знізіліся, увага аддавалася асобным аб'ектам сац. прызначэння (бальніцы, школы і інш.). Вядучая арг-цыя па праектаванні сельскага буд-ва — унітарнае прадпрыемства Дзіпрасельбуд. Гл. таксама *Жыллё, Народнае дойлідства, Драўлянае дойлідства.*

Літ.: Соколовский В.Э., Алимов Р.Н. Архитектура нового белорусского села. Мн., 1979. *У.Э.Сакалоўскі, Р.І.Белагорцаў, Н.М.Нядзелька.*

«СЕ́ЛЬСКАЯ ГАЗЕ́ТА», назва газ. *«Белорусская нива»* ў 1921—91.

СЕ́ЛЬСКАЯ ГАСПАДА́РКА, адна з найважнейшых галін матэрыяльнай вытв-сці, якая забяспечвае насельніцтва харч. прадуктамі, а прам-сць сыравінай. Займаецца вырошчваннем с.-г. культур і гадоўляй с.-г. жывёлы. Падзяляецца на *раслінаводства, жывёлагадоўлю* і *кормавытворчасць*. Уключае таксама некаторыя віды першаснай перапрацоўкі раслін і жывёльных прадуктаў, гадоўлі жывой цяглавай сілы. У шэрагу краін да С.г. адносяць і *лясную гаспадарку*. Дакладнае спалучэнне галін забяспечвае рацыянальнае выкарыстанне матэрыяльных і прац. рэсурсаў. Гал. сродак вытв-сці ў С.-г. — зямля, якая ў час выкарыстання пры ўмове правільных да яе адносін не змяншае сваёй вартасці, г.зн. не амартызуе, а, наадварот, можа яе павялічваць. Значная частка С.-г. валавой прадукцыі выступае ў далейшым вытв. працэсе як сродак вытв-сці. С.г. моцна залежыць ад умоў навакольнага асяроддзя, што абумоўлівае асаблівасці арганізацыі вытв. працэсу.

Чалавецтва займаецца С.г. прыкладна 10—15 тыс. гадоў. Збіральніцтва, паляванне і рыбная лоўля вызначалі поўную залежнасць людзей ад прыроды. Вынікам развіцця грамадскіх адносін з'явілася ўзнікненне ў неаліце с.-г. дзейнасці, што ў далейшым абумовіла пэўную незалежнасць людзей ад умоў навакольнага асяроддзя. Першай галіной С.г., якая забяспечвала такую незалежнасць, лічыцца жывёлагадоўля. На базе збіральніцтва ўзнікла раслінаводства, калі чалавек пачаў апрацоўваць простымі прыладамі глебу для задавальнення сваіх патрэб. На працягу доўгага часу ў адпаведнасці з мясц. ўмовамі ўзнікалі, удасканальваліся і змяняліся сістэмы земляробства ад прымітыўных да інтэнсіўных, паляшаліся карысныя якасці жывёлы. Пры малаінтэнсіўнай нізкапрадукцыйнай вытв-сці С.г. мела натуральны характар. З ростам інтэнсіўнасці многія галіны набылі таварны характар, узніклі зоны спецыялізацыі.

Плошча с.-г. угоддзяў на Зямлі каля 4,8 млрд. га, або 34% сушы (1999). У большасці краін асн. галіна С.г. — збожжавая гаспадарка. Збожжавыя і зернебабовыя культуры (пшаніца, кукуруза, рыс і інш.) займаюць амаль палову пасяўных плошчаў свету. Асн. пасевы пшаніцы знаходзяцца ў Еўропе, Паўн. Амерыцы і Азіі, кукурузы — у Паўн. Амерыцы, рысу — у краінах Азіі. Сусв. вытв-сць за год у сярэднім каля 400 млн. т. З тэхн. культур пашыраны бавоўнік, лён-даўгунец, цукр. трыснёг і цукр. буракі, сланечнік, масліны, бульба і інш. Большасць тэхн. культур вырошчваецца ў краінах, што развіваюцца, якія і выступаюць на сусв. рынку як гал. экспарцёры; з эканамічна развітых краін па вытв-сці тэхн. культур вылучаюцца толькі ЗША. У апошнія гады 20 ст. шырокую вядомасць набылі танізуючыя культуры (чай, кава, какава). Сусв. вытв-сць кавы за год складае 6 млн. т, чаю і какавы — па 2,5 млн. т. Асн. вытворцы кавы — Бразілія, Калумбія, Кот-д'Івуар, Уганда, Бурундзі. Па вытв-сці чаю вылучаюцца Кітай, Індыя, Шры-Ланка, Бангладэш, В'етнам. У сучаснай С.г. важнае месца займаюць агародніцтва, вінаградарства і садоўніцтва. Сусв. вядомасць мае вытв-сць пладовых культур у Міжземнамор'і, Каліфорніі, Фларыдзе. Большая частка вінаграднікаў сканцэнтравана ў краінах Зах. Еўропы і Паўн. Афрыкі. У сусв. гандлі вял. значэнне набылі бананы, плантацыі якіх знаходзяцца пераважна ў краінах Лац. Амерыкі, вільготных трапічных раёнах Афрыкі і Азіі. Сярод галін жывёлагадоўлі найб. развіццё атрымалі *буйной рагатай жывёлы гадоўля, свінагадоўля* і *авечкагадоўля*. У 2000 буйн. раг. жывёлы было каля 1,4 млрд. галоў, свіней — 0,9 млрд. галоў, авечак — каля 1,1 млрд. галоў. У сусв. гандлі прадукцыяй жывёлагадоўлі першыя месцы займаюць развітыя краіны. Гал. краіны-экспарцёры ялавічыны — Аўстралія, Германія, Францыя, Новая Зеландыя, Нідэрланды, ЗША; свініны — Нідэрланды, Бельгія, Данія, Канада; бараніны — Новая Зеландыя, Аўстралія, Вялікабрытанія; мяса птушкі — Францыя, ЗША, Нідэрланды; воўны — Аўстралія, Новая Зеландыя, Аргенціна, Уругвай, Паўд.-Афр. Рэспубліка. Індустрыялізацыя і урбанізацыя прывялі да зніжэння ўдз. вагі насельніцтва, занятага ў С.г., да 44% (1998). У 1960—90-я г. ў прамыслова развітых краінах у сярэднім доля занятых у С.г. знізілася з 13 да 7%, а ў краінах, што развіваюцца — з 65 да 57%. Адпаведна доля С.г. ва ўнутр. валавым прадукце скарацілася з 7 да 4% і з 46 да 21%. З агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва ў С.г. заняты: у Азіі і Афрыцы больш за 60%, у Паўд. Амерыцы і Акіяніі каля 19%, у Еўропе і Паўн. Амерыцы — 9—10%. З пач. 1960-х г. на сусв. рынку с.-г. прадукцыі гал. таварапатокі і аб'ёмы вытв-сці рэгулююцца міжнар. арг-цыямі.

На С.г. істотна ўплывае навук.-тэхн. прагрэс, які ўдзельнічае праз перабудову ў інш. сферах гаспадаркі, мадэрнізацыю і індустрыялізацыю самой галіны. У 1920—30-я г. прагрэс у с.-г. вытв-сці адбываўся праз трактарызацыю; у 1940—50-я г. — праз селекцыю і хімізацыю; у 1960-я г. — праз «зялёную» рэвалюцыю. З 1980-х г. пачалося развіццё біятэхналогіі і камп'ютэрызацыі. У сучасны перыяд 78% зямной паверхні маюць сур'ёзныя прыродныя абмежаванні для развіцця земляробства, 13% плошчаў маюць нізкую прадукцыйнасць, 6% — сярэднюю і толькі 3% — высокую. У пач. 21 ст., нягледзячы на навук.-тэхн. прагрэс і глабалізацыю эканомікі, С.г. застаецца на нізкім узроўні развіцця. Найб. перадавыя тэхналогіі выкарыстоўваюцца ў эканам. развітых краінах Еўразіі, Паўн. Амерыкі, Аўстраліі і Новай Зеландыі.

На Беларусі с.-г. дзейнасць узнікла, як мяркуюць, у канцы неаліту (канец 5—4-е тыс. да н.э.). У 13—14 ст. сфарміраваліся асн. формы феад. і сял. землеўладання, катэгорыі феадалаў і сялян. Асн. галіной было раслінаводства. Вырошчвалі жыта, авёс, грэчку, гарох, лён-даўгунец, каноплі. Неад'емнай часткай С.-г. заставаліся разнастайныя промыслы: пчалярства, рыбалоўства, паляванне, рамёствы. З'яўленне фальваркаў, арыентаваных на вытв-сць таварнай прадукцыі, прыпадае на 15—16 ст. Першая аграрная рэформа (*валочная памера*) 2-й пал. 16 — 1-й пал. 17 ст. прывяла да дакладнага ўліку і рацыянальнага размеркавання зямель, уніфікацыі сял. павіннасцей. У зах. і цэнтр. Беларусі С.г. стала індывідуальнай праз падворнае землекарыстанне. Пасля далучэння да Рас. імперыі бел. губерні былі ўцягнуты ў яе госп. сістэму, што

Да арт. **Сельская гаспадарка**. Жывёлагадоўчы комплекс у Брэсцкім раёне.

дазволіла забяспечыць рынак збыту с.-г. прадукцыі і стымуляваць яе вытв-сць, пашырыць пасевы тэхн. культур (лёну, канапель, бульбы), вызначыць раёны з акрэсленай с.-г. спецыялізацыяй. Сусв. аграрны крызіс 1880—90-х г. зрабіў нявыгадным вытв-сць збожжа на Беларусі як таварнай прадукцыі. Сітуацыя тут ускладнілася ўтварэннем зоны таварнай вытв-сці збожжа ў чарназёмнай зоне Рас. імперыі. У выніку асн. галіной С.г. Беларусі стала малочная жывёлагадоўля, у важныя кірункі яе спецыялізацыі ператварыліся льнаводства і авечкагадоўля. Значна паўплывала на С.г. сталыпінская агр. рэформа. Напярэдадні 1-й сусв. вайны Беларусь заставалася агр. краінай: каля 75% яе жыхароў былі заняты ў С.г., доля якой у нац. прыбытку складала 67,5%. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 ішло аднаўленне разбуранай войнамі с.-г. вытв-сці, яно прыблізна завяршылася да 1925. У 1929 у БССР пачалася паўсюдная *калектывізацыя*, якая суправаджалася *раскулачваннем*. Да 1935 у калгасах апынулася 85,6% гаспадарак, абагульнена 92,3% пас. плошчаў. У гасп. жыцці ўсталяваліся метады пазаэканам. прымусу, склалася сістэма неэквівалентнага абмену паміж горадам і вёскай, узнікла адчужэнне селяніна ад асн. сродкаў вытв-сці і вынікаў працы. Вялізныя страты С.г. Беларусі прычынены ў гады 2-й сусв. вайны: разбурана 10 тыс. калгасаў, 92 саўгасы, 36 МТС, прыкладна на 40% скараціліся пасяўныя плошчы, пагалоўе буйн. раг. жывёлы знізілася амаль на 49%, коней — на 61, свіней — на 89, авечак і коз — на 78%, поўнасцю разбурана энергетычная і тэхн. база С.г. У пасляваенны перыяд праведзена калектывізацыя і ў Зах. Беларусі, прыняты шэраг захадаў па матэрыяльным стымуляванні, удасканаленні планавання і арганізацыі с.-г. вытв-сці, перавод яе на інтэнсіўны шлях развіцця. У 1970—80-я г. ў выніку спецыялізацыі і канцэнтрацыі на аснове міжгасп. і аграпрамысл. інтэграцыі адбыўся пэўны рост с.-г. вытв-сці. Але звышцэнтралізаванае кіраванне, манапалізм у вытв-сці, бюракратызм не дазволілі зламаць механізм тармажэння, забяспечыць развіццё прадукцыйных сіл. Недаацэнка с.-г. працы стымулявала адток сельскага насельніцтва ў гарады, вяла да пастарэння і абязлюдзення вёскі. За 1960—80-я г. ўдз. вага сельскага насельніцтва знізілася да 35%. Катастрофа на Чарнобыльскай АЭС, распад СССР, агульны эканам. крызіс абвастрылі супярэчнасці агр. сектара краіны. Перавага адзяржаўленай калгасна-кааператыўнай уласнасці, слабая эканам. матывацыя працы сялянства пакуль яшчэ стрымліваюць развіццё С.г. Марудна пашыраюцца новыя формы прадпрыемстваў у С.г. (акц. т-вы, асацыяцыі, кааператывы і інш.), фермерства. Розніца ў цэнах на прамысл. прадукцыю і с.-г. сыравіну перашкаджае эканам. развіццю С.г. краіны. На Беларусі ўдз. вага занятага ў С.г. насельніцтва складае (2000) 14,1%, у інвестыцыях у асн. капітал 6,7% у асн. фондах 16,5% у валавым унутр. прадукце 12,7%. Налічваецца 1730 калгасаў, 617 саўгасаў, 2,5 тыс. сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак. Сярод прадпрыемстваў 48,8% стратных. Асн. паказчыкі развіцця С.г. гл. ў табл. 1 і 2.

С.г. Беларусі спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, вытв-сці бульбы і лёну. На тэр. краіны вылучаюць 5 зон спецыялізацыі, якія ўтварыліся пад уздзеяннем розных фактараў: кліматычных і глебавых умоў, аб'ёмаў і структуры попыту насельніцтва і прам-сці на прадукцыю С.г., размяшчэння гаспадарак адносна да прадпрыемстваў па перапрацоўцы с.-г. сыравіны, трансп. умоў, узроўню цэн на с.-г. прадукцыю, ступені забяспечанасці прац. рэсурсамі. У гэтых зонах шмат агульнага і ў той жа час кожная з іх мае свае асаблівасці. Ва ўсіх зонах развіта збожжавая гаспадарка, вырошчваюцца тэхн. культуры і бульба, паўсюдна гал. галіна — жывёлагадоўля. Аднак структура пасяўных плошчаў і суадносіны відаў жывёлы істотна розняцца. Асн. харч. культурамі з'яўляюцца жыта і пшаніца. Некалькі больш пашыраны пасевы жыта на пясчаных і супясчаных глебах Палесся, пшаніцы — у Брэсцкай, Гродзенскай, на ПдЗ Мінскай і на У Гомельскай абласцей. Найб. плошчы ячменю і аўса ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях. Для палескіх раёнаў характэрны пасевы кармавога лубіну на зерне. Паўн. і паўн.-ўсх. часткі Беларусі найб. прыдатныя для пасеваў і лёну-даўгунцу. Пасевы цукр. буракоў сканцэнтраваны на ўрадлівых глебах вакол цукр. з-даў. У некаторых раёнах (Петрыкаўскім, Лідскім і інш.) вырошчваюць эфіраалейныя культуры. Большая ўдз. вага пасеваў бульбы характэрна для Брэсцкай, Гомельскай і Мінскай абласцей. Вакол Мінска сфарміравалася самая развітая зона агародніцтва. Па развіцці садоўніцтва вылучаецца Мінская і Гомельская вобл., асабліва ў прыгарадных зонах. Развядзенне буйн. раг. жывёлы характарызуецца раўнамерным размяшчэннем па тэр. краіны. У цэнтр., паўд. і зах. раёнах больш развіта свінагадоўля. Птушкагадоўля — самая індустрыяльная галіна жывёлагадоўлі. У асн. развіваецца на спецыялізаваных прадпрыемствах, найб. з якіх Мінскае ВА па птушкагадоўлі, Смалявіцкая бройлерная ф-ка, Аршанская, Баранавіцкая, Кобрынская птушкафабрыкі. З інш. галін жывёлагадоўлі пэўнае развіццё атрымалі рыбаводства, зверагадоўля і пчалярства. Гл. таксама *Аграрнае пытанне, Аграрны крызіс, Аграрныя рэформы.*

Літ.: Алисов Н.В., Хорев Б.С. Экономическая и социальная география мира (общий обзор). М., 2000; Социально-экономическая география зарубежного мира. М., 1998; Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1—2. Мн., 1994—95.

Г.С.Смалякоў.

СЕ́ЛЬСКІЯ ПАСЁЛІШЧЫ, населеныя пункты (*вёскі, пасёлкі* і інш.) па-за гарадскімі тэрыторыямі. Паводле колькасці жыхароў С.п. ўмоўна падзяляюцца на малыя (да 100), сярэднія (100—500) і буйныя (больш за 500 чал.). Найб. пашыраны с.-г. паселішчы, дзе жыхары заняты ў сельскай гаспадарцы; існуюць С.п. з іншай занятасцю (абслугоўванне чыг. станцый, лячэбных і сан.-курортных устаноў, у лясной гаспадарцы і інш.) і змешаныя. На Беларусі паводле перапісу насельніцтва 1999 існуе 23 459 С.п. (3084 тыс. чал.), у т.л. малых вёсак — 16 774, сярэдніх —

Вытворчасць асноўных відаў с.-г. прадукцыі ў Беларусі

Табліца 1

Віды прадукцыі	1913	1940	1960	1980	1990	1995	2000
Збожжа, млн. т	2,6	2,7	2,2	4,1	7,0	5,5	4,5
Ільновалакно, тыс. т	32,8	36,5	84,4	61,0	52,0	60,0	37,0
Цукровыя буракі, тыс. т	—	—	383	1122	1479	1472	1474
Бульба, млн. т	4,1	11,9	10,6	9,3	8,6	9,5	8,7
Агародніна, тыс. т	—	673	843	733	749	1031	1379
Садавіна, тыс. т	—	—	—	414	373	383	—
Мяса ў забойнай вазе, тыс. т	219,3	274,7	401,8	857,0	1181,0	657	598
Малако, млн. т	1,4	2,0	3,2	6,1	7,5	5,1	4,5
Яйцы, млн. шт.	413,0	611,8	867,8	3035,0	3657,0	3373,0	3288,0

Пагалоўе жывёлы і птушкі ў Беларусі (тыс. галоў)

Табліца 2

Віды прадукцыі	1916	1941	1961	1980	1990	1996	2000
Буйная рагатая жывёла	2293	2843	3666	6735	7166	5054	4221
у т.л. каровы	1610	1956	2021	2748	2439	2137	1845
Коні	1483	1170	519	234	219	229	217
Свінні	2444	2520	3164	4437	5204	3895	3566
Авечкі і козы	2050	2578	1213	564	510	262	174
Птушка, млн. галоў	—	14,7	18,6	37,3	49,8	40,1	30,1

5311, буйных — 1374. Дробныя С.п. найб. пашыраны на ПнЗ, буйнанаселеныя на Пд, у палескай зоне. Гл. таксама *Сельскае насельніцтва*. *Дз.М.Кудзелка.*

Да арт. **Сельскія паселішчы**. Вёска Гуменаўшчына ў Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобл.

«СЕ́ЛЬСКОЕ ХОЗЯ́ЙСТВО БЕЛОРУ́ССИИ», назва часопіса *«Хозяин»* у 1957—90.

СЕ́ЛЬЦЫ, возера ў Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл., у.бас. р. Лучайка (выцякае з возера), за 14 км на ПнУ ад г. Глыбокае. Пл. 0,24 км², даўж. 670 м, найб. шыр. 450 м, даўж. берагавой лініі 1,95 км. Пл. вадазбору 8,25 км². Катлавіна тэрмакарставага тыпу. Схілы выш. 5—7 м, у верхняй ч. разараныя. Пойма шыр. 25—50 м, забалочаная, пад лугам. Берагі нізкія, месцамі забалочаныя.

СЕ́ЛЬЦЫ, нізіннае балота ў Ляхавіцкім, Баранавіцкім і Івацэвіцкім р-нах Брэсцкай вобл., у вадазборы р. Шчара і яе прытока р. Мышанка. Пл. 6,2 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 4,6 тыс. га. Глыб. торфу да 3,8 м, сярэдняя 1,4 м. Запасы торфу 10,9 млн. т (здабываецца на ўгнаенне). На балоце асушана адкрытай сеткай больш за 3 тыс. га. Асушаныя землі пад шматгадовымі травамі, збожжавымі і прапашнымі культурамі. На неасушаных землях пераважаюць бярозавыя лясы з вярбовым ярусам.

СЕЛЯДЗЕ́Ц БАЛТЫ́ЙСКІ, гл. *Салака*.

СЕЛЯДЦАПАДО́БНЫЯ (Clupeiformes), атрад касцістых рыб. Вядомыя з верхняюрскага, шматлікія з верхнемелавога перыяду. 3 сям.: *селядцовыя*, анчоусавыя (Engraulidae), дарабавыя (Chirocentridae); каля 70 родаў, 300 відаў. Пашыраны ў трапічных, умераных і зрэдку ў халодных марскіх водах; некат. жывуць у прэсных водах або заходзяць у рэкі на нераст. Чародныя пелагічныя рыбы.

Даўж. 5—75 см (дараб да 3,7 м), маса (акрамя дараба) ад некалькіх грамаў да 4 кг. Цела серабрыстае, сціснутае з бакоў, укрытае цыклоідная луской. Спінны плаўнік 1, брушныя плаўнікі маюць 6—8 прамянёў. Адкрыта-пузырныя, плавальны пузыр злучаецца каналам са страваводам і мае адросткі. Добра развіты сейсмасенсорныя каналы на жабравай накрыўцы. Кормяцца планктонам (дараб — драпежнік). Многія С. аб'екты промыслу.

СЕЛЯДЦО́ВЫЯ, селядцы (Clupeidae), сямейства рыб атр. селядцападобных. 7 падсям., каля 20 (па інш. звестках каля 50) родаў, у т.л. *пузанкі, салака, сардзіны, цюлькі, шпроты*, сардзінелы. Каля 190 відаў. Пашыраны ў морах ад Арктыкі да Субантарктыкі, разнастайныя ў тропіках; некат. віды ва ўмераных і халодных водах.

Даўж. 35—45 см, у прахадных форм да 75 см, маса да 2 кг. Цела сціснутае з бакоў, укрытае вял. цыклоіднай луской. Спіна зеленавата-шэрая, бакі і бруха серабрыстыя. Характэрна адсутнасць прабадной лускі бакавой лініі (ёсць толькі 2—5 адразу за галавой). На галаве развітыя сейсмасенсорныя каналы. Уздоўж сярэдняй лініі бруха ў многіх відаў ёсць кіль з прывостранай лускі. Кормяцца пераважна планктоннымі беспазваночнымі. Аб'екты промыслу.

Селядцовыя: 1 — шэд; 2 — кілька каспійская; 3 — селядзец атлантычны; 4 — чарнаспінка.

СЕЛЯЗЁНКА, няпарны парэнхіматозны орган *лімфоіднай сістэмы* пазваночных жывёл і чалавека. Размешчана ў левай падрэбернай вобласці брушной поласці, каля страўніка, на ўзроўні 9—11 рэбраў. Даўж. С. ў дарослага чалавека 12 см, шырыня — 7—8 см, маса 150—200 г. «Дэпо» крыві, выконвае імуналагічную, ахоўную функцыі. С. як біял. фільтр (праз яе за 1 мін працякае 750—800 мл крыві) забяспечвае выдаленне з крыві антыгенаў.

У філагенезе С. звязана са стрававальным трактам. У кругларотых і дваякадыхальных рыб прадстаўлена вял. колькасцю лімфоіднай тканкі кішэчніка або страўніка. У інш. пазваночных С. адасабляецца ад страўніка ў самаст. орган. *А.С.Леанцюк.*

СЕЛЯЗНЁЎ Анатоль Пятровіч (н. 29.1.1923, в. Ярушнікава Кіраўскай вобл., Расія), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Камышлоўскае ваеннае пях. вучылішча (1942), Свярдлоўскі юрыд. ін-т (1952). У Вял. Айч. вайну з 1944 на 1-м Бел. фронце. Рота на чале з лейт. С. вызначылася ў 1944 у баі за в. Вузляны Рудзенскага (цяпер Пухавіцкага) р-на Мінскай вобл., дзе адбіла 6 контратак ворага і вызваліла вёску.

СЕЛЯЗНЁЎ Генадзь Мікалаевіч (н. 6.11.1947, г. Сяроў Свярдлоўскай вобл., Расія), расійскі паліт. і дзярж. дзеяч, журналіст. Скончыў Ленінградскі ун-т (1974). Працаваў у Ленінградскай камсамольскай арг-цыі (1968—74), нам. рэдактара і рэдактарам абл. газ. «Смена» (1974—80), у аддзеле прапаганды ЦК ВЛКСМ. Рэд. газ. «Комсомольская правда» (1980—88), «Учительская газета» (1988—91), «Правда» (1991—93), «Правда России» (1995—96). З 1993 дэп. Дзярж. думы ад Камуніст. партыі Рас. Федэрацыі, з 1996 — старшыня Дзярж. думы (перавыбраны ў 2000). З 1996 старшыня Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

«СЕЛЯНІ́Н», таварыства памешчыкаў, заможных сялян, чыноўнікаў царскай адміністрацыі, правасл. духавенства кансерватыўна-манархічнага кірунку ў пач. 20 ст. Узнікла ў 1905 у Вільні. Кіраўнікі — мясц. манархісты С.Кавалюк, П.Каранкевіч, А.*Пшчолка*, Л.*Саланевіч*, А.Уруцэвіч. Абараняла інтарэсы царскага самаўладдзя на Беларусі, выс-

тупала супраць бел. нац.-вызв. руху, газ. *«Наша ніва»*, не прызнавала права беларусаў на самавызначэнне і стварэнне нац. дзяржаўнасці, лічыла Беларусь неад'емнай часткай Рас. імперыі. З 1906 уваходзіла ў *«Рускі ўскраінны саюз»*. Пасля расколу т-ва ў 1908 створана псеўдабел. арг-цыя *«Беларускае таварыства»* на чале з Саланевічам. У 1906—15 выдавала час. *«Крестьянин»*. Спыніла сваю дзейнасць восенню 1915.

У.М.Мяснюк.

СЕЛЯХІ́, біялагічны заказнік рэсп. значэння ў Брэсцкім р-не. Створаны ў 1988 з мэтай захавання натуральных умоў існавання рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл. Пл. 260 га. Уключае *Селяхоўскае возера* і прылеглую тэрыторыю. Рэльеф пласкахвалісты з грывамі і дзюнамі выш. 8—10 м. Лясы з хвойнікаў імшыстых, лішайнікавых, даўтамошных, верасовых, чарнічных. У флоры 225 відаў сасудзістых раслін, 27 лішайнікаў, 36 мохападобных, у т.л. рэліктавая паўдрэвападобная папараць — чыставуст каралеўскі, занесены ў Чырв. кнігу Беларусі. У арнітафаўне 40 відаў птушак, у т.л. бусел чорны, паганкі малая і шэрашчокая, крачка малая, саракуш шэры, занесеныя ў Чырв. кнігу Беларусі. У час сезонных міграцый на воз. Селяхоўскім адпачываюць вадаплаўныя птушкі.

П.І.Лабанок.

СЕ́ЛЯХ-КАЧА́НСКІ Вячаслаў Антонавіч (24.12.1885, г.Лагойск Мінскай вобл. — 8.8.1976), бел. і рас. спявак, хар. і тэатр. дзеяч, педагог. Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю (1905) і Пецярбургскую кансерваторыю (1915). У 1905—10 працаваў настаўнікам на Віленшчыне і інш. З 1915 у трупе Марыінскага імператарскага т-ра, адначасова ў 1916—18 у Александрынскім драм. т-ры. У 1923—25 выкладаў у Муз. драм. ін-це ў Петраградзе. За 1915—23 выканаў больш за 20 вядучых партый, некат. разам з *Ф.Шаляпіным*. З 1924 выкладаў у оперным і хар. класах Мінскага муз. тэхнікума і кіраваў муз. падсекцыяй Інбелкульта, арганізаваў пры ёй бел. хар. студыйны калектыў (у 1927 паставіў першую на бел. мове оперу «Русалка» А.Даргамыжскага). З 1927 дырэктар БДТ-1, з 1930 заг. Бел. драм. курсаў, дырэктар Бел. тэатр. тэхнікума і Бел. тэхнікума сцэн. мастацтва. З 1933 на Украіне і ў Расіі. З 1943 узначальваў Мінскі гар. т-р, кіраваў аддзелам культуры і мастацтва Бел. нар. самапомачы і аддзелам мастацтва ў Бел. цэнтр. радзе. З 1944 у Германіі, з 1950 у ЗША, дзе займаўся арганізацыяй хароў і тэатр. груп, ладзіў канцэрты і спектаклі. Аўтар зб. песень «Спеўнік беларускага жаўнера» (1975).

Тв.: Уласны жыццяпіс // Беларуская мэмуарыстыка на эміграцыі. Нью-Йорк. 1999.

Літ.: Сачанка Б. Снящца сны аб Беларусі... Мн., 1990; Юрэвіч Л. Беларускі тэатр і драматургія на эміграцыі // Тэатр. творчасць. 1997. № 6; 1998, № 1; Кекелева Т. Спявак Селях-Качанскі // Спадчына. 1999. № 2; Селях С. Вядомы і забыты: Старонкі творчай біягр. Вячаслава Селяха // Мастацтва. 2001. № 5—6.

Т.В.Кекелева.

СЕЛЯХО́ЎСКАЕ ВО́ЗЕРА, Селяхінскае возера, Селяхі. У Брэсцкім р-не, у бас. р. Зах. Буг, за 55 км ад г. Брэст. Пл. 0,5 км², даўж. 1,3 км, найб. шыр. 800 м, найб. глыб. 8,6 м, даўж. берагавой лініі 3,7 км. Пл. вадазбору 9,75 км². Катлавіна суфазійна-карставага тыпу. Схілы спадзістыя, часткова пад ворывам. Мелкаводдзе пясчанае, глыбей дно сапрапелістае. Зарастае ўздоўж берагоў. Упадае канава, злучана ручаём з воз. без назвы.

СЕЛЯШЧУ́К Мікалай Міхайлавіч (4.8.1947, в. Велікарыта Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл. — 25.9.1996), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1976). Працаваў як жывапісец, графік, майстар экслібрыса. У творчасці імкнуўся паказаць непарыўную сувязь вытокаў нац. культуры і сучаснага мастацтва, спалучаў сюррэалістычную манеру выканання з вобразамі бел. нар. фальклору і этнаграфіі. Яго кніжная графіка адметная насычанасцю дэкар. дэталямі, фантаст. выявамі, арх. помнікамі, прадметамі побыту і адзення, гульнёй фактур і святлаценяў. Адмаўленне ад апавядальнасці ўласціва афармленню кніг «Бацькаў дар» (1984), «Прагны багацей», «Індыкала-Кудыкала» Р.Барадуліна (абедзве 1986, залаты медаль біенале кніжнай іл. ў Браціславе 1989), «Казкі беларускіх пісьменнікаў» (1988), «Сымон-музыка» (1988—90) і інш. Графічныя прыёмы, пэўныя сюжэты часта пераносіў у станковы жывапіс, якому ўласцівы алегарычнасць, метафарычнасць маст. мовы, часам філас. асэнсаванне рэчаіснасці. Вял. ўвагу ў творах аддаваў спалучэнню фактуры фону, абстрактных элементаў з колеравымі і фігуратыўнымі, што паступова ўзмацнілася ў 1990-я г.: «Наведванне сядзібы Агінскага ў Залессі» (1978), «Памяці Максіма Багдановіча» (1981), «Матылькі тут не жывуць» (1982), «Бацька памёр» (1982—84), «Канец сезона туманаў», «Позняя восень» (1984), серыя «Казачны калейдаскоп» (1984—85), «Свята IV», «Хвіліна маўчання» (абодва 1989), «Гучанне музыкі нябёсаў» (1990), «Прагулка», «Калі цвіце язмін» (абодва 1991), «Метамарфозы» (1992), «Злашчасны вечар», «Люблю цябе сустракаць» (абодва 1994), «Спякотны вечар з вясёлкай на крэсле» (1995), «Вяртанне на Радзіму. Шоп-тур» (1996) і інш. Працаваў у станковай графіцы. Дзярж. прэмія Беларусі 1992.

Літ.: Баразна М.Р. Беларуская кніжная графіка 1960—1990-х гг. Мн., 2001; Каваленка В. Палёт над прасторай і часам // Мастацтва. 1997. № 8.

М.Р.Баразна.

М.Селяшчук. Злашчасны вечар. 1994.

«7 ДНЕЙ», інфармацыйна-праблемны штотыднёвік. Выдаецца са студз. 1990 у Мінску на рус. мове. Асвятляе ўнутрыпаліт. падзеі, стан эканомікі ў краіне, сац. праблемы суверэннай Беларусі. Друкуе каментарыі прафес. палітыкаў, эканамістаў, сацыёлагаў і палітолагаў, публіцыст. і аналіт. матэрыялы, асвятляе пытанні бел. нац. культуры, гісторыі Беларусі. Мае рубрыкі: «7 пытанняў на тыдні», «Госць тыдня», «Па вашых просьбах», «Судовы нарыс», «Падрабязнасці» і інш. Выходзяць дадаткі «7 начэй» і «7 дзён здароўя».

Н.З.Філіпоўская.

«СЕМ ВО́ЛЬНЫХ МАСТА́ЦТВАЎ», «сем вольных навук» (лац. «Septem artes liberalis»), навучальныя дысцыпліны сярэдневяковай школы і падрыхтоўчых («артыстычных» ф-таў ун-таў. Уключалі 2 звязаныя цыклы: трывіум (граматыка, рыторыка і дыялектыка) і квадрывіум (арыфметыка, геаметрыя, астраномія і музыка). Як абагульненне ант. ведаў «С.в.м.» з'явіліся ў 5 ст.; у сістэму падрыхтоўчай

адукацыі канчаткова аформіліся ў 6 ст. У эпоху Адраджэння роля «С.в.м.» як сістэмы свецкіх ведаў значна вырасла. У далейшым «С.в.м.» ляглі ў аснову гуманіт. і прыродазнаўчай адукацыі.

СЕМ ДЗІВО́САЎ СВЕ́ТУ, у антычным грамадстве вызначэнне 7 (у старажытнасці свяшчэнная лічба) твораў стараж. архітэктуры і скульптуры, найб. славутых сваімі маст. якасцямі, незвычайнымі памерамі і тэхн. вырашэннем. У іх склад уваходзілі: стараж.-егіпецкія піраміды каля г. *Гіза*, храм Артэміды ў Эфесе ў Малой Азіі (цяпер Турцыя; каля 550 да н.э., шыр. 51 м, даўж. 105 м, 127 18-метровых калон, у 356 да н.э. спалены *Герастратам*), т. зв. вісячыя сады Семіраміды ў *Вавілоне* (7 ст. да н.э.), маўзалей Маўсола ў *Галікарнасе* (сярэдзіна 4 ст. да н.э., арх. Піфей, Сатыр), статуя Зеўса ў *Алімпіі* (каля 430 да н.э., скульпт. Фідый; выш. 12 м, аздоблена золатам і слановай косцю), Калос радоскі (статуя Геліяса) на в-ве Родас (Грэцыя; 292—280 да н.э., скульпт. Харас), Фароскі маяк у *Александрыі* (каля 280 да н.э., арх. Састрат Кнідскі; выш. 130 м). Да нашага часу захаваліся толькі піраміды. Каля г. Хіла (Ірак) знаходзяцца руіны скляпеністых збудаванняў, верагодна, на іх дахах разбіваліся тэрасныя сады Семіраміды. У Брыт. музеі (Лондан) захоўваюцца фрагменты скульптуры Галікарнаскага маўзалея (скульпт. Скопас, Цімафей, Брыяксіс, Леахар). Храм Артэміды (іанічны дыптэр) адбудаваны арх. Хейракратам, захаваліся фундаменты. Іншыя дзівосы свету вядомы па маст. выявах і апісаннях розных часоў.

Першае пісьмовае ўпамінанне пра С.дз.с. прыпісваецца фінікійскаму пісьменніку Антыпатру з Сідона (2 ст. да н.э.), які апісаў толькі існуючыя на той час творы (зруйнаваная *Вавілонская вежа*, прылічаная грэкамі да дзівосаў свету, не ўвайшла ў спіс С.дз.с.). У эпоху Адраджэння С.дз.с. апісаў аўстр. арх. І.Б.Фішэр фон Эрлах у сваіх «Накідах пра гісторыю архітэктуры» (1721).

Літ.: Федосик В.А. Семь чудес света. Мн., 2002.

СЕМА́НТЫКА (франц. sémantique ад грэч. sēmantikos які абазначае) у мовазнаўстве, 1) увесь змест, інфармацыя, якія перадаюцца мовай ці якой-н. яе адзінкай (словам, граматычнай формай слова, словазлучэннем, сказам). 2) Раздзел *семіётыкі* і тыпалагічнай лінгвістыкі, які разглядае знакі паводле іх значэння і тэксты паводле іх сэнсу. Апісвае зместавую сістэму мовы, спосабы перадачы сэнсу пры дапамозе зместавых адзінак (асобных слоў). Словы ў сваю чаргу вызначаюцца паслядоўнасцю марфем і фанем. Фанемы не маюць самастойнага значэння, але дазваляюць яго абнавіць для слова праз камбінаторыку фанем, бо іх сукупнасць утварае лексему як лексічнае значэнне слова. Паслядоўнасць лексем складае сказ, але сказ не складаецца з лексем. Яго сінтакс. характарыстыкі ўплываюць на змены ў значэнні, таму мы адрозніваем сэнс тэксту ад сумы значэнняў яго састаўляючых. У гэтым асн. роля С. Семантычныя адзінкі характарызуюцца рознымі тыпамі адносін: сінтанімічнымі, антанімічнымі, аманімічнымі.

Літ.: Апресян Ю.Д. Лексическая семантика. М., 1974; Міхневіч А.Я. Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы. Мн., 1976; Мартынов В.В. Категории языка: Семиол. аспект. М., 1982; Плотников Б.А. Основы семасиологии. Мн., 1984; Вежбицкая А. Семантические универсалии и описание языков: Пер. с англ. М., 1999. *В.У.Мартынаў.*

СЕМА́НТЫКА ЛАГІ́ЧНАЯ, раздзел *металогікі*, які вывучае сэнс і значэнне выразаў мовы, а таксама інтэрпрэтацыю розных *фармалізаваных моў*. У апошнія гады больш даследуе натуральную мову. Як навука пачала афармляцца ў канцы 19 — пач. 20 ст. ў працах Ч.Пірса, Г.Фрэге, Б.Расела, А.Тарскага і інш. У С.л. вылучаюць тэорыі рэферэнцыі і сэнсу. Тэорыя рэферэнцыі — аснова тэорыі доказу ў логіцы, якая вывучае дачыненне выразаў мовы да абазначаных аб'ектаў. Асн. катэгорыі: «імя», «абазначэнне», «ісціннасць», «мадэль», «выканальнасць», «інтэрпрэтацыя» і г.д. Тэорыя сэнсу даследуе дачыненне знака да зместу. Асн. катэгорыі: «сэнс», «сінанімія», «праўдзівасць аналітычная», «праўдзівасць лагічная» і інш. С.л. аналізуе прычыны *парадоксаў* і цяжкасцей, якія ўзнікаюць пры семантычным аналізе. Яе метадалогія ўжываецца ў лінгвістыцы, семіётыцы, тэорыі і практыцы машыннага перакладу. Гл. таксама *Семантыка* ў мовазнаўстве.

Літ.: Фреге Г. Логика и логическая семантика: Пер. с англ. М., 2000. *В.М.Пешкаў.*

СЕМА́РАНГ (Semarang), горад у Інданезіі, на в-ве Ява. Адм. ц. прав. Цэнтр. Ява. Каля 1,2 млн. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог, знешнегандл. і рыбалоўны порт на паўн. беразе в-ва Ява. Аэрапорт. Прам-сць: харч. (перапрацоўка на экспарт кавы, чаю, каўчуку, копры, тытуню, цукру), дрэваапр., лесапільная, тэкст., суднарамонтная. Вытв-сць нац. муз. інструментаў. ЦЭС. Ун-т. Паблізу — цэнтр разьбярства па дрэве Джапара.

СЕМАСІЯЛО́ГІЯ (ад грэч. sēmasia значэнне, сэнс + *...логія*), раздзел *мовазнаўства*, які вывучае спосабы абазначэння паняццяў і тыпы змен іх назваў; выкарыстоўваецца і як сінонім *семантыкі*. Тэрмін «С.» ўжываецца ў гіст. і *параўнальна-гістарычным мовазнаўстве*, асабліва пры аналізе характару семантычных змен у сувязі з іх этымалагічнай трактоўкай, рэканструкцыяй першаснай, унутр. формы слова і ў выпадках семантычнага паралелізму стандартных шляхоў развіцця значэнняў слоў. Тэарэт. С. вызначае найб. агульныя заканамернасці, якія пашыраюцца на цэласнае семантычнае поле. Асобную галіну С. складаюць метафарычныя змены па падабенстве, метанімічныя — па сумежнасці, якія разам з *гіпербалай* і *сінекдахай* ствараюць семіятычны аспект С.

Літ.: Звегинцев В.А. Семасиология. М., 1957; Покровский М.М. Избранные работы по языкознанию. М., 1959; Мартынов В.В. Категории языка: Семиол. аспект. М., 1982; Плотников Б.А. Основы семасиологии. Мн., 1984.

В.У.Мартынаў.

СЕМАФО́Р (франц. sémaphore ад грэч. sēma знак, сігнал + phoros які нясе), сігнальнае прыстасаванне. Адрозніваюць С. на чыгунках, што не абсталяваны аўтаблакіроўкай — мачта з рухомымі крыламі, становішча якіх падае сігнал цягніку; С. марскі (рачны) — сігнальная мачта з рэяй (брусам) на ўчастках, дзе суднам дазволены рух у адным напрамку; С. флажковы — спосаб зрокавай сігналізацыі і сувязі, па якім літары, лічбы ці службовыя сігналы перадаюць рухам рук (з флажкамі) сігнальшчыка. У наш час на чыгунцы і аўтадарогах звычайна выкарыстоўваюць *святлафор*.

Схема размяшчэння **сямі дзівосаў свету**: 1 — піраміды каля г. Гіза; 2 — храм Артэміды ў Эфесе; 3 — сады Семіраміды ў Вавілоне; 4 — маўзалей Маўсола ў Галікарнасе; 5 — статуя Зеўса ў Алімпіі; 6 — Калос радоскі на востраве Родас (Грэцыя); 7 — Фароскі маяк у Александрыі.

СЕМАЧО́К (Trientalis), род кветкавых раслін сям. першакветных. 3—4 віды. Пашыраны ва ўмераным і халодным паясах Паўн. паўшар'я. На Беларусі 1 від — С. еўрапейскі (T. europaea), нар. назва вароніны вочкі. Характэрная расліна яловых лясоў, трапляецца таксама ў мяшаных лясах, хмызняках, парках.

Семачок еўрапейскі.

Шматгадовыя карэнішчавыя травяністыя расліны выш. да 20 см. Сцябло прамастойнае. Суцэльнае лісце збліжанае ў кальчак. Кветкі белыя, адзіночныя, на доўгіх кветаносах. Плод — каробачка. Лек. і дубільныя расліны.

А.М.Скуратовіч.

СЕМАШКЕ́ВІЧ Раман Мацвеевіч (1904, в. Лебедзева Маладзечанскага р-на Мінскай вобл. — 1937), бел. жывапісец, графік, скульптар. Скончыў бел. гімназію і маст. студыю ў Вільні, Віцебскі маст. тэхнікум па класе скульптуры і жывапісны ф-т Вышэйшых маст.-тэхн. майстэрняў у Маскве. Удзельнік 3-й Усебел. маст. выстаўкі (1930). У графічных і жывапісных работах адлюстроўваў побыт сялян, родную прыроду, а таксама сац.-рэв. тэматыку: «Даліна ракі Граматухі. Алтай», «Коннік на белым кані», «Белыя кветкі», «Галадоўка палітзняволеных у Лукішскай турме», «На этапе», «Паны забіраюць апошнюю карову», «Бойка з секвестратарамі», «Здзек паліцыі». Аўтар групавога партрэта М.Галадзеда, М.Гікалы і А.Александровіча, партрэтаў А.Грыневіча, В.Таўлая, Я.Купалы, Я.Коласа і інш. Выканаў скульпт. кампазіцыю «Юны змаганец».

Літ.: Л і с А. Пякучай маланкі след. Мн., 1981.

А.С.Ліс.



Чыгуначны семафор.

СЕМАШКЕ́ВІЧ Рыгор Міхайлавіч (12.9.1945, в. Дамашы Маладзечанскага р-на Мінскай вобл. — 11.6.1982), бел. паэт і літаратуразнавец. Канд. філал. н. (1970). Скончыў БДУ (1966). Настаўнічаў. З 1970 выкладаў бел. л-ру ў БДУ. Друкаваўся з 1961. Яго вершам (зб-кі

Рыгор Семашкевіч.

«Леснічоўка», 1968; «Субота», 1973) уласцівы прастата, шчырасць, псіхалагізм, багацце рытмікі, філасафічнасць. Нарыс «Браніслаў Эпімах-Шыпіла» (1968) пра бел. выдаўца і мовазнаўца, манаграфія «Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе (канец XIX — пачатак XX ст.)» (1971) напісаны на багатым дакумент. матэрыяле, жывой мовай, з увагай да грамадз., маральна-этычных, псіхал. матываў дзейнасці пісьменнікаў і дзеячаў нац.-вызв. руху. Сатыр. аповесць «Бацька ў калаўроце» (1976) прасякнута гумарам, дасціпнай выдумкай, гратэскам.

Тв.: Выпрабаванне любоўю. Мн., 1982; Лічыла дні зязюля. Мн., 1987.

Я.Р.Лецка.

СЕ́МЕЖАВА, вёска ў Капыльскім р-не Мінскай вобл., на р. Морач. Цэнтр сельсавета і сельскай калект.-долевай гаспадаркі. За 32 км на Пд ад г. Капыль, 147 км ад Мінска, 23 км ад чыг. ст. Цімкавічы. 1297 ж., 629 двароў (2001). Сярэдняя школа-сад, Дом культуры, б-ка, бальніца, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. С. — вядомы цэнтр ткацкага рамяства.

Засн. ў 2-й пал. 15 ст. У 1578 мястэчка Навагрудскага пав., уладанне кн. Слуцкіх, Магільніцкіх. У 1622 у С. 195 дымоў. У час Паўн. вайны 1700—21 шведы ў крас. 1706 загубілі амаль усё насельніцтва С. З 1793 у Рас. імперыі ў Мінскай губ. У 1886 мястэчка, 996 ж., 269 двароў, школа, 2 царквы, яўр. малітоўны дом, капліца, 3 крамы, цэнтр нар. маст. ткацтва. У 1908 працавалі кравецкі і гарбарны цэхі, 2 млыны. У 1914 у С. 2818 ж., 518 двароў. З 1924 вёска, цэнтр сельсавета Чырвонаслабодскага, з 1959 Капыльскага р-наў.

Ф.К.Абрамчык.

СЕМЕ́СТР (лац. semestris шасцімесячны ад sex шэсць + mensis месяц), палавіна навуч. года ў вышэйшых і сярэдніх спец. навуч. установах (звычайна 16—18 вучэбных тыдняў). У некат. краінах (напр., Вялікабрытаніі, ЗША) навуч. год дзеліць на *трыместры*.

СЕМІЁТЫКА (грэч. sēmeiōtikon ад sēmeion знак, адзнака), с е м і я л о г і я, навука, што вывучае ўласцівасці знакавых сістэм ці знакаў, кожнаму з якіх пэўным чынам надаецца пэўнае значэнне. Даследуе асн. характарыстыкі любых знакаў і іх спалучэнняў (слоў і словазлучэнняў, метафар паэт. моў, хім. і матэм. сімвалаў) і сістэм знакаў (вусных і пісьмовых натуральных моў, штучных лагічных і машынных моў, моў паэт. школ і інш.).

Асн. прынцыпы С. сфармуляваны ў 2-й пал. 19 ст. амер. логікам Ч.Пірсам і швейцарскім лінгвістам Ф. дэ Сасюрам (разглядаў мовазнаўства як частку С.). У сучаснай С. вылучаюць 3 састаўныя часткі: с і н т а к т ы к у (вывучае адносіны паміж самімі знакамі), с е м а н т ы к у (разглядае заканамернасці адносін паміж знакам і яго сэнсам) і п р а г м а т ы к у (даследуе адносіны паміж знакамі і тымі, хто іх выкарыстоўвае). С., што ўзнікла як лагічная навука, паўплывала на развіццё не толькі мовазнаўства, але стала агульным метадам для шэрагу даследаванняў у мастацтвазнаўстве, літ.-знаўстве і агульнай тэорыі культуры. Універсальнасць семіятычнага падыходу заснавана на тым, што па сутнасці ўся інфармацыя, якую набывае чалавек на працягу жыцця (у выніку практычнай дзейнасці, засваення мовы і г.д.) і якая складае асн. змест яго разумення, уяўляе сабой адлюстравальна-знакавую сістэму.

Літ.: М а р т ы н о в В.В. Кибернетика. Семиотика. Лингвистика. Мн., 1966; Я г о ж. Семиологические основы информатики. Мн., 1974; Я г о ж. Категории языка: Семиол. аспект. М., 1982; С т е п а н о в Ю.С. Семиотика. М., 1971; Л о с е в А.Ф. Знак. Символ. Миф. М., 1982; Семиотика. М., 1983.

В.У.Мартынаў.

СЕМІЁТЫКА ў м е д ы ц ы н е, вучэнне аб прыкметах (сімптомах) хвароб і паталаг. стане здароўя чалавека; састаўная частка *дыягностыкі*. Адрозніваюць С. агульную і асобную. Прадмет агульнай — прыкметы, якія адносяць да агульнай характарыстыкі хворага (пол, узрост, целасклад, спадчыннасць і інш.); асобнай — сімптомы канкрэтных захворванняў, механізмы іх узнікнення, развіцця і інш.

СЕМІНА́Р (ад лац. seminarium рассаднік), групавыя заняткі па асобных дысцыплінах у ВНУ, таксама заняткі па спец. падрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі, адукацыі і інш.; адзін з асн. відаў практычных заняткаў. Уключае абмеркаванне студэнцкіх, аспіранцкіх дакладаў, рэфератаў і інш. самаст. работ, паглыбленае вывучэнне пэўнага курса, найб. важных тэм, галіны навукі і г.д.

Існуюць таксама міжнар. навук. С. даследчага характару.

СЕМІНА́РЫЯ (ад *семінар*), агульнаадукацыйная навуч. ўстанова, што рыхтавала духавенства або настаўнікаў для пач. школ. Узнікненне духоўных С. звязана з Трыенцкім саборам (1545—63), на якім было вырашана арганізаваць шэраг спец. навуч. устаноў для падрыхтоўкі добраадукаваных асоб. Каталіцкія духоўныя С. звычайна адкрывалі мясц. біскупы. Выкладчыкамі ў іх былі прадстаўнікі якога-н. манаскага ордэна. На Беларусі першыя духоўныя С. засн. ў Вільні (1582) і Краславе (1755), належалі ордэну місіянераў, які да 1-й трэці 19 ст. кантраляваў С. ў Беластоку, Вільні, Заслаўі, Магілёве. Дамініканцам належала С. ў Мінску. Духоўныя С. існавалі таксама ў Брэсце і Нясвіжы. Пры Віленскім ун-це ў 1808—32 дзейнічала гал. духоўная С., якая рыхтавала біскупаў, прэлатаў і канонікаў каталіцкага і уніяцкага веравызнання. Яна мела праграму духоўнай акадэміі і была разлічана на 50 клірыкаў. Пасля задушэння паўстання 1830—31 большасць духоўных С. скасавана. У сярэдзіне 19 ст. каталіцкія духоўныя С. захаваліся ў Вільні, Мінску, Магілёве. Яны былі разлічаны на 20—50 клірыкаў; у іх выкладаліся: багаслоўе, царк. абрады, маральная, дагматычная, палемічная тэалогіі, кананічнае права, рыторыка, логіка, духоўнае красамоўства, свяшчэнная і айч. гісторыя, лац., франц., польск. і рус. мовы, нар. права, патрыстыка, фізіка, матэматыка, спевы, паліт. эканомія. З 1822 выкладчыкамі маглі быць толькі асобы, якія мелі дыпломы доктара ці магістра багаслоўя. Для паступлення ў С. патрэбен быў дазвол губернатара. У пач. 20 ст. каталіцкая духоўная С. захавалася толькі ў Вільні. Першая уніяцкая духоўная С. адкрыта ў 1746 у мяст. Свержань. На пач. 19 ст. яны дзейнічалі ў Лаўрышаве, Супраслі, Полацку, Жыровічах. Навуч. праграма была такая ж, як і ў каталіцкіх С. У 1820—30-я г. яны скасаваны ці ператвораны ў праваслаўныя. Праваслаўныя духоўныя С. пачалі стварацца на Беларусі з 2-й пал. 18 ст. (у 1752 у Магілёве, у 1785 у Слуцку) і па сваёй праграме нагадвалі езуіцкія *калегіумы*. У адпаведнасці са статутам 1808 мелі 6 класаў і падпарадкоўваліся духоўным акадэміям. Іх праграма адпавядала 4 старэйшым класам гімназій; выкладаліся: рус., грэч. і лац. мовы, эстэтыка, рыторыка, гісторыя, геаграфія, алгебра, геаметрыя, механіка, медыцына, логіка, метафізіка, мараль, багаслоўе, герменеўтыка, царк. абрады, сельская гаспадарка. Пасля заканчэння С. лепшыя выпускнікі працягвалі адукацыю ў акадэміях, астатнія выкладалі ў пав. і прыходскіх духоўных вучылішчах ці ішлі ў манастыры. Паводле рэформы 1867—69 С. сталі незалежнымі ад духоўных акадэмій, з навуч. праграмы выключаны сельская гаспадарка і медыцына, уведзена педагогіка; пры С. адкрыты нядзельныя школы. У 1884 прыняты новы статут духоўных С., паводле якога ў іх павінен быў выкладацца поўны курс класічнай гімназіі, а таксама псіхалогія, гісторыя філасофіі, сельская гаспадарка і медыцына. На пач. 20 ст. такія С. дзейнічалі ў Віцебску, Вільні, Мінску, Магілёве. У наш час у Жыровічах існуе праваслаўная духоўная С. (гл. *Мінская вышэйшая духоўная семінарыя*). У 19 ст., з пашырэннем ідэі І.Г.Песталоці аб сістэматычнай падрыхтоўцы настаўнікаў, пачалі масава адкрывацца *настаўніцкія семінарыі* (першапачаткова яны з'явіліся ў Францыі і Германіі ў канцы 17 ст.).

Літ.: Бобровский П.О. Русская греко-униатская церковь в царствование императора Александра I. СПб., 1890; Жукович П.Н. Об основании и устройстве главной духовной семинарии при Виленском университете (1803—1832 гг.). СПб., 1887; Памятная книжка Виленского учебного округа на 1915 г. Вильна, 1915. *А.Ф.Самусік.*

СЕМІРА́ДСКІ (Siemiradzki) Хенрык (Генрых Іпалітавіч; 22.10.1843, с. Печанегі Харкаўскай вобл., Украіна — 23.8.1902), польскі і расійскі жывапісец, прадстаўнік акадэмізму. Правадз. чл. Пецярбургскай АМ (з 1873), праф. (з 1877). Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1864—70), пенсіянер АМ у Мюнхене (1871) і Рыме (1872—77). Жыў пераважна ў Рыме. Аўтар карцін на ант. і раннехрысціянскія сюжэты, якія вызначаюцца майстэрствам кампазіцыі і малюнка, светлым каларытам, дэталёвай распрацоўкай эфектаў сонечнага асвятлення: «Светачы хрысціянства» (1876), «Танец сярод мячоў», «Оргія часоў Тыберыя на востраве Кіпры» (абодва 1881), «Хрыстос у Марфы і Марыі» (1886), «Фрына на святе Пасейдона ў Элеўсіне» (1889) і інш.

СЕМІРАМІ́ДА, гл. *Шамурамат*.

СЕМІТАЛО́ГІЯ, комплекс навук, якія вывучаюць мову, л-ру, культуру і гісторыю семітамоўных народаў. Вывучае жывыя і мёртвыя *семіцкія мовы*, уключае *асірыялогію, арабістыку, біблеістыку, гебраістыку*, сабеістыку, эфіопіку і інш.

Вывучэнне семіцкіх моў пачалі сірыйскія, араб., яўр. вучоныя-багасловы з мэтай удакладнення чытання і разумення рэліг. кніг (7—12 ст.). У Еўропе С. ўзнікла ў эпоху Адраджэння (15—16 ст.), калі павялічылася цікавасць да вывучэння семіцкіх моў і *Біблii*; яе заснавальнікі І.Ройхлін і І.Буксторф Старэйшы ў Германіі і Ю.Ц.Скалігер у Францыі.

Навук. дысцыплінай С. стала ў 19 ст., калі выйшлі фундаментальныя працы па граматыцы, параўнальным аналізе, эпіграфіцы і інш. праблемах С. У 19 ст. найб. ўклад у С. зрабілі вучоныя Германіі: Т.Нёльдэке, В.Ф.Г.Гезеніус (стараж.-яўр. слоўнік і граматыка), Ю.Вельгаўзен, Р.Кітэль (біблеістыка), Ф.Прэторыус, К.Ф.А.Дзільман (эфіопіка), М.Лідзбарскі (эпіграфіка), К.Брокельман (параўнальная граматыка семіцкіх моў); а таксама Францыі (А.І.Сільвестр дэ Сасі, Э.М.Катрмер), Венгрыі (І.Гольдцыер), Расіі (Д.А.Хвольсан, А.Я.*Гаркавi*, Б.А.*Тураеў*, М.В.*Нікольскі*, у сав. час — І.Ю.*Крачкоўскі*, Н.В.Пігулеўская, Р.Ш.Шарбатаў, М.У.Юшманаў і інш.). У 1882 утворана Рас. палесцінскае т-ва (з 1918 — пры АН). У 20 ст. С. развівалася на базе матэрыялаў, здабытых у выніку археал. раскопак на Б. Усходзе, знаходак *Мёртвага мора рукапісаў*. На Беларусі праблемы С. даследавалі М.М.*Нікольскі*, Г.М.*Ліўшыц*, Г.В.Сініла і інш.

СЕМІ́ТА-ХАМІ́ЦКІЯ МОВЫ, афразійскія мовы, макрасям'я моў, пашыраных ў Зах. Азіі, Паўн. Афрыцы, на в-ве Мальта; арабскамоўныя прадстаўнікі С.-х.м. жывуць таксама ў шматлікіх краінах па-за межамі асн. моўнага арэала. Сучасныя даследчыкі падзяляюць С.-х.м. на 6 груп: *семіцкія мовы* (*арабская мова, іўрыт*, мальтыйская, амхарская, мехры, джыбалі, грай; мёртвыя — ханаанейская, угарыцкая, фінікійская, стараж.-арамейская, мінейская, гафат, гаэз і інш.); *берберскія мовы* (берабер, шлех, туарэг, гхат, аір, зенага, ціндуфт, кабільская і інш.; мёртвыя — лівійская, нумідыйская, гетульская); чадскія мовы (хаўса, ангас, боле, варджы, тэра, мубі і інш., усяго больш за 150); кушыцкія мовы (беджа, сідама, самалі, алагва, кафа і інш.); амоцкія мовы, або зах. падгрупа кушыцкай групы: амета, яма, кафа, моча і інш); егіпецкая група (*копцкая мова*, мёртвая — стараж.-егіпецкая). С.-х.м. надзвычай стракатыя ў тыпалагічных адносінах з прычыны іх глыбокай старажытнасці і мноства іншамоўных кантактаў. Ім уласцівы: у фанетыцы — траістае проціпастаўленне зычных (глухі—звонкі—«эмфатычны»), багатая сістэма афрыкат і сібілянтаў, гартанная змычка, доўгія і кароткія галосныя; у марфалогіі — разгалінаваная сістэма вытворных дзеяслоўных асноў, т.зв. парод, наяўнасць катэгорый ліку, роду, часткова склону. Да С.-х.м. адносяцца сістэмы са стараж. пісьмовымі традыцыямі. Найб. значныя віды пісьма: *егіпецкае пісьмо, угарыцкае пісьмо, арабскае пісьмо, эфіопскае пісьмо* і інш.

Літ.: Дьяконов И.М. Семито-хамитские языки. М., 1965; Порхомовский В.Я. Афразийские языки // Сравнительно-историческое изучение языков разных семей: Задачи и перспективы. М., 1982. *А.Я.Міхневіч.*

СЕМІ́ТЫ (ад Сім, грэч. Sēm, стараж.-яўр. Шэм, імя аднаго з біблейскіх прабацькоў), тэрмін, які ўжываецца да народаў, што гавораць на *семіцкіх мовах*; уведзены ў навук. ўжытак у 1780 ням. вучонымі А.Л.Шлёцэрам і І.Г.Айхгарнам. Паводле найб. распаўсюджанай думкі радзіма С. — Аравійскі п-аў, адкуль адбылося рассяленне семіцкіх плямён. На мяжы 4—3-га тыс. да н.э. адасобіліся групы зах. і ўсх. семітаў. Усх. С. ў пач. 3-га тыс. да н.э. трапілі ў Міжрэчча (гл. *Месапатамія*), дзе ў сярэдзіне 3-га тыс. да н.э. стварылі дзяржаву *Акад*, а да пач. 2-га тыс. да н.э. асімілявалі стараж. насельніцтва *Шуме-*

ра. У далейшым гісторыя гэтай групы С. цесна звязана з гісторыяй *Вавілоніі* і *Асірыі.* Зах. група С. засяліла Сірыю і Палесціну, у сярэдзіне 3-га тыс. да н.э. яна стварыла на Пн Сірыі дзяржаву Эбла. Пазней з іх вылучыліся *амарыты, хананеі, фінікійцы, яўрэі* і *арамеі*; мова апошніх паступова стала найб. пашыранай семіцкай мовай Б.Усходу ў стараж. час. Паўд. С. стварылі ў 2—1-м тыс. да н.э. своеасаблівую цывілізацыю на Пд Аравіі (дзяржавы *Маін, Сабейскае царства*, Катабан, *Хім'ярыцкае царства* і інш.). У пач 1-га тыс. н.э. сфарміравалася агульная супольнасць *арабаў*, якія ў выніку *арабскіх завяванняў* (7—9 ст.) рассяліліся на вял. тэр. ў Азіі і Афрыцы, асімілявалі семіцкія і некат. інш. народы. У 1-м тыс. да н.э. С. з Аравіі трапілі ў Эфіопію. Цяпер да С. адносяць арабаў, яўрэяў, мальтыйцаў, асірыйцаў, народы Эфіопіі (амхара, тыгрэ і інш.).

СЕМІ́ЦКІЯ МО́ВЫ, група *семіта-хаміцкіх моў.* Пашыраны ў Зах. Азіі і Афрыцы на Пн ад пустыні Сахара. Падзяляюцца на групы: паўн.-перыферыйную, ці паўн.-ўсх. (мёртвая акадская мова); паўн.-цэнтр., ці паўн.-зах. [жывыя мовы: *іўрыт*, асірыйская мова; мёртвыя: эблаіцкая, амарэйская, ханаанейская, угарыцкая, фінікійска-пунічная, стараж.-яўрэйская (ранняя форма іўрыта), яўдзі і арамейскія дыялекты]; паўд.-цэнтр. (*арабская мова*, мальтыйская на Мальце); паўд.-перыферыйную (жывыя: мехры, джыбалі, сакатрыйская і інш.; мёртвыя: мінейская, сабейская, катабанская, якія аб'ядноўваюцца як паўд.-аравійскія эпіграфічныя); эфіосеміцкую (жывыя: паўн. падгрупа — тыгрынья, ці тыграй, і тыгрэ; паўд. падгрупа — амхарская, аргоба, харары, шэраг дыялектаў, якія ўмоўна аб'ядноўваюцца пад назвай гураге; нядаўна вымерлы гафат; мёртвая: гаэз, ці эфіопская, якая належыць да паўн. падгрупы). Паўд.-цэнтр., паўд.-перыферыйная і эфіосеміцкая групы часта аб'ядноўваць у адну паўд., ці паўд.-зах. групу. Найб. істотныя рысы С.м. — акрэсленая будова кораня слова, адсутнасць словаскладання, граматычна ці семантычна значымае чаргаванне галосных у корані (апафанія). Найб. стараж. помнікі С.м. — акадскія клінапісныя тэксты Ірака і эблаіцкія — у Сірыі (сярэдзіна 3-га тыс. да н.э.), а таксама ўласныя імёны і назвы мясцовасцей Палесціны, якія захаваліся ў егіпецкіх надпісах 3—2-га тыс. да н.э.

Літ.: Дьяконов И.М. Семито-хамитские языки. М., 1965. *А.Я.Міхневіч.*

СЕМІЯЛО́ГІЯ, гл. *Семіётыка.*

СЕМНА́ЦЦАТЫ З'ЕЗД КП(б)Б. Адбыўся 10—18.6.1938 у Мінску. Прысутнічалі 422 дэлегаты з рашаючым і 124 з дарадчым голасам ад 31 526 чл. і канд. у чл. партыі (без вайсковых арг-цый). Парадак дня: справаздачы ЦК КП(б)Б (А.А.Волкаў), Рэвіз. камісіі КП(б)Б (М.І.Малінін); выбары ЦК КП(б)Б, Рэвіз. камісіі КП(б)Б. З'езд падвёў вынікі гасп. і культ. будаўніцтва ў БССР за год, што мінуў пасля *шаснаццатага з'езда КП(б)Б.* Прырост валавой прадукцыі прам-сці за гэты час склаў 15,8%, у калгасы аб'яднана 88% сял. гаспадарак (96,2% пасяўных плошчаў), іх абслугоўвалі 200 МТС. З'езд падкрэсліў неабходнасць большай актыўнасці аргкомаў і райкомаў партыі ў працы па выкананні пастановы студзеньскага (1938) пленума ЦК ВКП(б) «Аб памылках партарганізацый пры выключэнні камуністаў з партыі, аб фармальна-бюракратычных адносінах да апеляцый выключаных з ВКП(б) і аб мерах па ліквідацыі гэтых недахопаў». На 15.5.1938 у КП(б)Б было разгледжана 5366 апеляцый, 3143 выключаныя адноўлены ў партыі. Волкаў, які выступаў са справаздачным дакладам, зачытваў запіскі НКУС БССР, КПК пры ЦК ВКП(б) па БССР, аддзелаў ЦК, данасныя лісты, з якіх вынікала, што антысав. падполле «звіло сабе гнёзды» ў парт. апараце, органах дзярж. улады, наркаматах і грамадскіх арг-цыях. У заключэнне ён сказаў, «што ворагі рассыпаліся па ўсёй Беларусі, па ўсіх яе ўчастках — у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, у савецкіх органах, у школах, ВНУ, камсамольскіх органах, у ваенных арганізацыях, аж да магазінаў», а таму 1938 павінен стаць годам «новага выкарчоўвання ворагаў». Апублікаваны 18.6.1938 у газ. «Советская Белоруссия» даклад Волкава меў ужо не той тэкст, які захоўваецца ў стэнаграме Нац. архіва Рэспублікі Беларусь. На з'ездзе прысутнічалі прадстаўнікі ЦК ВКП(б), якія аб усім, што адбывалася, паведамлялі ў Маскву. 18 чэрв. ў прэзідыуме з'явіўся сакратар ЦК ВКП(б) А.А.Андрэеў разам з нам. заг. Аддзела кіруючых парт. органаў ЦК ВКП(б) П.К.Панамарэнкам. Андрэеў паведаміў, што Волкаў не спраўляецца са сваімі абавязкамі і таму адклікаецца на інш. работу, а ў склад ЦК КП(б) рэкамендуецца ўвесці Панамарэнку. З'езд выбраў ЦК КП(б)Б з 66 чл. і 23 канд., Рэвіз. камісію КП(б)Б з 9 чл.

Літ.: Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 3. 1933—1945. Мн., 1985. *Р.П.Платонаў.*

СЕ́МПЕР (Semper) Іаханес (22.3.1892, с. Пахуверс, Эстонія — 21.2.1970), эстонскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Эстоніі (1964). Скончыў Тартускі ун-т (1928), у 1928—40 выкладаў у ім. У 1930—40 працаваў у перыяд. друку. У 1940 міністр асветы Эстоніі. Друкаваўся з 1910. Аўтар раманаў «Камень на камень» (1939), «Чырвоныя гваздзікі» (1955) пра эст. інтэлігенцыю, зб-каў грамадз. і філас. лірыкі «Не магу маўчаць» (1943), «Як бы змог ты жыць?» (1958), «Старонкі, як лісты ў вецер» (апубл. 1972), п'ес, дарожных нататак, кн. мемуараў «Падарожжа ў мінулае» (1969). На бел. мову яго асобныя вершы пераклалі Ю.Свірка, Я.Сіпакоў.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1976.

СЕМУКА́ЧЫ, вёска ў Магілёўскім р-не. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 45 км на ПдЗ ад Магілёва, 3 км ад чыг. ст. Семуковічы. 473 ж., 206 двароў (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЕ́МЧАНКА Ігар Валянцінавіч (н. 21.7.1959, г. Гомель), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1997), праф. (1999). Скончыў Гомельскі ун-т (1981), дзе і працуе (з 1989 дэкан, з 1997 заг. кафедры). Навук. працы па оптыцы крышталёў і кампазіцыйных анізатропных матэрыялаў, нелінейнай оптыцы, акустаэлектроніцы. Развіў тэорыі распаўсюджвання і ўзаемадзеяння эл.-магн. і акустычных хваль у гіратропных асяроддзях з прасторавай і часавай перыядычнай структурай.

Тв.: Объемные акустические волны в кристаллах во вращающемся электрическом поле. Мн., 1998 (разам з С.А.Хахомавым); Electromagnetics of bi-anisotropic materials: Theory and applications. Amsterdam, 2001 (у саўт.).

СЕ́МЧАНКА Павел Апанасавіч (н. 11.11.1938, в. Вялікія Прыцкі Кагарлыцкага р-на Кіеўскай вобл.), бел. мастак, педагог. Праф. (1995). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1970). З 1970 выкладае ў Бел. АМ. Працуе ў галіне шрыфту, каліграфіі. Даследуе бел. друкарскі шрыфт, зрабіў графічны аналіз літар выданняў Ф.Скарыны. Заснаваў курс маст. шрыфту ў Бел. АМ. Аўтар каліграфічных лістоў па матывах паэзіі М.Багдановіча (1981, «Страцім-лебедзь», 1991; серыя «Перапісчык», 1998—2000), Я.Купалы і Я.Коласа (1982), А.Блока (1983), Т.Шаўчэнкі (1984), Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра» («Паранены волат», 1998; «Прабач мяне», 2000), аповесці М.Гогаля «Шынель» (2001); вобразна-шрыфтавых кампазіцый «Мінск» (1979), «Хатынь» (1980), «Ленінград» (1981), «Свяшчэнная вайна» (трыпціх, 1985), «Паланэз» (1991), «Аз» (1993), «Рэха даўніны» (абедзве 1998), вышыванага арнаментальна-шрыфтавога пано для музея Я.Коласа ў Мінску (1982), скруткаў «Проба пяра», «Танец пяра» (абодва 1998—2000) і інш.

Тв.: Основы шрифтовой графики. Мн., 1978; Мелодыі каліграфа. Мн., 1993.

СЕ́МЯВАЯ ВА́ДКАСЦЬ, вадкая частка *спермы*, якая мае сакрэты, што выпрацоўваюцца *семяннікам* і дапаможнымі залозамі мужч. палавой сістэмы. Выдзяляецца ў аб'ёме 2—10 мл. Мае пажыўныя рэчывы для *сперматазоідаў*, буферныя сістэмы з фасфатаў і карбанатаў, слізі, якія аблягчаюць праходжанне спермы па палавых шляхах самкі, і клетачныя элементы. *А.С.Леанцюк.*

СЕМЯДО́ЛІ, першае лісце раслін, што развіваецца ў семі на зародку, які яшчэ не дыферэнцыраваны. Па форме, анат. будове і функцыях часта адрозніваюцца ад сапраўднага лісця, што ўтвараецца на конусе нарастання парастка. У хваёвых некалькі С. (2—15), у двухдольных — 2, у аднадольных —1. Пры надземным

прарастанні С. зелянеюць і здольныя да *фотасінтэзу* (напр., фасоля), пры падземным з'яўляюцца сховішчам для пажыўных рэчываў (напр., дуб), у семі з *эндаспермам* падаюць пажыўныя рэчывы ў надземную ч. парастка (напр., злакі). Пасля прарастання С. захоўваюцца на расліне часам на працягу некалькіх месяцаў (віды мар'янніку, падалешніку, плюшчу). *В.М.Прохараў.*

Я.Семяжон.

СЕМЯЖО́Н Язэп (сапр. Семяжонаў Іосіф Ігнатавіч; 16.11.1914, в. Пятровічы Смалявіцкага р-на Мінскай вобл. — 16.8.1990), бел. перакладчык, крытык, празаік, паэт. Засл. работнік культ. Беларусі (1989). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1938). Працаваў акцёрам у БДТ-3 (1932—34). Выкладаў у Мінскім суворaўскім вучылішчы (1953—60), БДУ (1961—75), адначасова працаваў у час. «Беларусь» (1962—67). Друкаваўся з 1931. Пераклаў з англ. мовы творы У.Шэкспіра, Дж.Байрана, Р.Бёрнса, Р.Браўнінга, Дж.Кітса, з венг. — Ш.Пецёфі, сучасных паэтаў, з італьян. — Дантэ, Дж.Радары, з ням. — Г.Гейнэ, Б.Брэхта, сучасных паэтаў, з польскай — паэму А.Міцкевіча «Пан Тадэвуш» (1985), Я.Івашкевіча, Ю.Славацкага, Ю.Тувіма, з рум. — Дж.Кэлінеску, З.Станку, з чэшскай і славацкай — В.Завады, В.Мігаліка, з франц. — П.Беранжэ, Э.Пацье, А.Рэмбо. На бел. і рус. мовы з лац. мовы пераклаў «Песню пра зубра» Міколы Гусоўскага (Дзярж. прэмія Беларусі імя Я.Купалы 1982). Асобнымі кнігамі ў яго перакладзе выйшлі зб-кі вершаў Радары «Неапаль без сонца» (1955), Бёрнса «Шатландская слава» (1957) і «Вам слова, Джон Ячмень!» (1983), раман М.Твэна «Жанна д'Арк» (1961, з Н.Цімафеевай), зб. класічнай і сучаснай паэзіі В'етнама «Апалены лотас» (1968), раман ням. пісьменніка Г.Ота «Пара ў дарогу, буслы!» (1982, з У.Чапегам), зб. «Сем цудаў свету» (1977), творы паэтаў свету. Для перакладаў С. характэрна дакладнае ўзнаўленне сэнсава-вобразнай структуры арыгінала, умелае карыстанне скарбамі роднай мовы.

Літ.: Бярозкін Р. Постаці. Мн., 1971; Рагойша В. Кантакты. Мн., 1982.

В.П.Рагойша.

СЕМЯЗА́ВЯЗЬ, семязачатак, шматклетачнае ўтварэнне насенных раслін, з якога развіваецца *насенне*. Мае ў сабе *нуцэлус*, дзе знаходзіцца мацярынская клетка мегаспор (мегаспарацыт), 1—2 *інтэгументы*, якія пры змыканні ўтвараюць вузкі канал — *мікраплe* (праз яго пылковая трубка пранікае да зародкавага мяшка) і фунікулюс (семяножку), што прымацоўвае С. да *плацэнты*. У кветкавых раслін С. утвараецца ў завязі, у голанасенных — адкрыта на відазмененым лісці (мегаспарафіле). Пасля апладнення, з пачаткам развіцця зародка С. ператвараецца ў семя, што развіваецца. Колькасць С. у завязі кветкавых раслін ад аднаго (у злакаў) да 1 млн. (у архідных). *В.М.Прохараў.*

СЕМЯНЕ́НКА Мікалай Мікалаевіч (н. 4.1.1939, в. Ходараў Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне глебазнаўства і аграхіміі. Д-р с.-г. н. (1992), праф. (2000). Скончыў БСГА (1968). З 1970 у Бел. НДІ глебазнаўства і аграхіміі, з 1993 вучоны сакратар Акадэміі агр. навук Беларусі, з 2001 у Бел. НДІ меліярацыі і лугаводства. Навук. працы па тэарэт. асновах і метадах кіравання рэжымам мінер. жыўлення с.-г. культур з выкарыстаннем ізатопаў, праблемах зберажэння энергарэсурсаў, земляробчай экалогіі, павышэнні якасці с.-г. прадукцыі.

Тв.: Азот в земледелии Беларуси. Мн., 1997 (разам з М.У.Неўмяржыцкім); Интегрированные технологии — одно из перспективных направлений повышения эффективности земледелия // Агроэкономика. 1998. № 6.

СЕМЯНЕ́НКА Міхаіл Васілевіч (н. 24.1.1950, в. Сапычы Пагарскага р-на Бранскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне насенняводства. Канд. с.-г. навук Скончыў БСГА (1972). З 1994 у Бел. НДІ земляробства і кармоў. Навук. працы па селекцыі і насенняводстве азімай пшаніцы. Стварыў і раянаваў гатункі азімай пшаніцы: Бярэзіна, Надзея, Сузор'е, Быліна, Легенда, Саната, Прэм'ера, Запавет. Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

Тв.: Результаты экологического испытания озимой пшеницы в условиях Белоруссии // Пути повышения урожайности полевых культур. Мн., 1981. Вып. 11.



П.Семчанка. Каліграфічныя кампазіцыі «Паланэз» і «Страцім-лебедзь». 1991.

СЕМЯНЕ́НЯ Ігар Мікалаевіч (н. 22.11.1960, Мінск), бел. вучоны ў галіне фізіялогіі. Д-р мед. н. (2001). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1983), працаваў у ім. З 1995 вучоны сакратар Аддзялення медыка-біял. навук Нац. АН Беларусі. Навук. працы па праблемах касм. экалогіі чалавека, ролі псіхікі ў механізмах захворвання і выздараўлення, функцыян. рэзервах арганізма і шляхах іх мабілізацыі, карэкцыі парушэнняў жыццядзейнасці прыроднымі фактарамі.

Тв.: Методологическое значение правила исходного состояния в физиологии и медицине // Здравоохранение Беларуси. 1994. № 11; Системно-кибернетический подход к проблеме социогенеза // Организация и управление. 2000. № 1; Проблема субфебрилитета: (фундаментальные аспекты). Мн., 2002.

У.С.Семяніхін.

СЕМЯНІ́ХІН Уладзімір Сяргеевіч (9.2.1918, г. Сумы, Украіна — 27.11.1990), расійскі вучоны ў галіне аўтаматыкі і тэлемеханікі. Акад. АН СССР (1972; чл.-кар. 1968). Герой Сац. Працы (1981). Скончыў Маскоўскі энергет. ін-т (1941). З 1963 кіраўнік шэрагу НДІ. Адначасова з 1966 праф. Маскоўскага ін-та радыётэхнікі, электронікі і аўтаматыкі. У 1971—74 нам. міністра радыёпрамысловасці. Навук. працы ў галіне аўтаматызаваных сістэм кіравання і спец. прыладабудавання. Дзярж. прэміі СССР 1970, 1976.

СЕМЯНКО́Ў Алег Ігнатавіч (н. 4.6.1935, Мінск), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі і інфарматыкі. Канд. тэхн. н. (1966), праф. (1982). Скончыў Ленінградскі электратэхн. ін-т (1959). З 1961 у АН Беларусі (у 1970—87 дырэктар Ін-та кібернетыкі). З 1987 у Мінскім НДІ прыладабудавання, з 1993 у Бел. ін-це інфармацыі і прагнозу. З 1998 нам. вучонага сакратара, з 2000 нач. аддзела міжнар. сувязей Прэзідыума Нац. АН Беларусі. Навук. працы па аўтаматызацыі інж.-канструктарскай творчасці, камп'ютэрнай графіцы, сістэме аўтам. праектавання, спец. прыладах вылічальнай тэхнікі. Дзярж. прэмія Беларусі 1978. Дзярж. прэмія СССР 1985.

Тв.: Основы построения систем автоматизированного проектирования. 2 изд. Киев, 1985 (разам з А.І.Пятрэнкам); Обработка и отображение информации в растровых графических системах. Мн., 1989 (у саўт.).

М.П.Савік.

СЕМЯНКО́Ў Віктар Іванавіч (н. 26.12.1925, в. Гімбатаўка Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. праваед. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1980), д-р юрыд. н. (1977), праф. (1978). Засл. дз. нав. Беларусі (1996). Скончыў Мінскі юрыд. ін-т (1954). Працаваў нар. суддзёй Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл. (1954—58). З 1961 у Ін-це філасофіі і права АН Беларусі (з 1983 нам. дырэктара). У 1996—97 нач. гал. ўпраўлення па рабоце з органамі заканад. і суд. улады Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. З 1997 заг. аддзела Ін-та дзяржавы і права Нац. АН Беларусі. Навук. працы па праблемах прац. права і заканадаўства аб ахове працы, нагляду і кантролю за выкананнем заканадаўства аб працы.

Тв.: Надзор и контроль за охраной труда в СССР. Мн., 1963; Охрана труда в СССР. 2 изд. Мн. 1976; Законодательство о труде: Юридич. справ. Мн., 1991 (у сааўт.); Трудовое право. Мн., 1997 (у сааўт.). *Г.А.Маслыка.*

СЕМЯННІКІ́, тэстыкулы, мужчынскія палавыя залозы, у якіх утвараюцца *сперматазоіды* і *палавыя гармоны*, пераважна *тэстастэрон* і інш. мужч. палавыя гармоны (*андрагены*), а таксама жан. палавыя гармоны (*эстрагены*). Найб. простыя — скопішчы палавых клетак у кішачнаполасцевых, у якіх семя выводзіцца шляхам разрыву сценкі або праз кішачнасасудзістую сістэму і далей праз ротавую адтуліну. У большасці пазваночных жывёл С. парныя, размешчаныя ў брушной поласці, у млекакормячых жывёл — у яе задняй ч. (клаачныя, хобатныя, кітападобныя і інш.) або ў машонцы (сумчатыя, драпежныя, капытныя, прыматы, чалавек), куды С. звычайна апускаюцца з брушной поласці праз пахвінны канал у працэсе развіцця зародка. Звонку С. ўкрыты шчыльнай абалонкай, унутры — веерападобна падзелены злучальнатканкавымі перагародкамі на долькі з семяннымі канальцамі, дзе ўтвараюцца сперматазоіды. Семявыносныя пратокі адкрываюцца ў мочаспускальны канал. У тканцы паміж семяннымі канальцамі знаходзяцца клеткі Лейдыга, якія выпрацоўваюць палавыя гармоны. У чалавека С. наз. семявымі залозамі або яечкамі. У мужчын даўж. С. 3—5 см, шыр. 2—3 см, маса 15—30 г. Функцыя С. рэгулюецца гіпаталамусам (рылізінг-фактары), адэнагіпофізам (ганадатропныя гармоны), гармонамі надныračнікаў і шчытападобнай залозы. *А.С.Леанцюк.*

СЕМЯНО́ВІЧ Антон Аляксандравіч (5.8.1917, в. Шабунеўшчына Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. — 25.8.2000), бел. крытык і літаратуразнавец. Д-р філал. н. (1971), праф. (1971). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1945). Настаўнічаў, працаваў у Ін-це л-ры АН Беларусі, выкладаў бел. л-ру ў БДУ, з 1963 у Мінскім пед. ун-це. Друкаваўся з 1949. Даследаваў бел. прозу і драматургію. Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (т. 1—2, 1965—66), «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. 2, 1969), падручнікаў для студэнтаў па гісторыі бел. л-ры і інш.

Тв.: Проза Якуба Коласа (дакастрычніцкі перыяд). Мн., 1953; Кандрат Крапіва. Мн., 1956; Змітрок Бядуля. Мн., 1960; Беларуская драматургія (дакастрычніцкі перыяд). Мн., 1961; Беларуская савецкая драматургія, 1917—1932. Мн., 1968; Ад вытокаў да сталасці: Бел. драматургія 1917—1945 гг. Мн., 1978; Гісторыя беларускай драматургіі, XIX — пачатак XX ст. Мн., 1985; Гісторыя беларускай савецкай драматургіі, 1917—1955 гг. Мн., 1990.

СЕМЯНО́ВІЧ Казімір (каля 1600 — пасля 1651), інжынер і тэарэтык артылерыі, мысліцель-гуманіст. Паходзіў з роду дробных князёў Семяновічаў, якія ў 14—16 ст. валодалі землямі на Віцебшчыне. Вучыўся ў Віленскай акадэміі. Удзельнік вайны Рэчы Паспалітай з Рас. дзяржавай 1632—34. З 1645 у Нідэрландах ваяваў у войску прынца Аранскага, у 1646 адкліканы з Нідэрландаў, прызначаны інжынерам, з 1648 нам. начальніка артылерыі Каралеўства

К.Семяновіч. Літаграфія В. і Л. Варэцаў. 1995.

Польскага. У 1650 выдаў у Амстэрдаме на лац. мове трактат «Artis magnae artilleriae pars prima» («Вялікае мастацва артылерыі, частка першая»), у якім апісаў канструкцыі і выкарыстанне гармат і ракет, тэхналогію вытв-сці пораху і інш. матэрыялаў для артылерыі, а таксама ўпершыню прапанаваў ідэю шматступеннай ракеты (з адпаведнымі чарцяжамі). Трактат перакладзены на франц., ням., англ., галандскую, дацкую і інш. мовы; паўтара стагоддзя быў адной з найважнейшых у Еўропе навук. прац па артылерыі. С. падрыхтаваў да друку і 2-ю частку сваёй працы, аднак выдаць не паспеў (пазней рукапіс згубіўся). С. прытрымліваўся гуманіст. светапогляду, войны лічыў найвялікшым няшчасцем для чалавецтва.

Літ.: Ивашкявичюс А. Казимир Семенович и его книга «Великое искусство артиллерии. Часть первая». Вильнюс. 1971; Бельскі А.М., Ткачоў М.А. Вялікае мастацтва артылерыі: Казімір Семяновіч. Мн., 1992.

СЕМЯНТО́ЎСКІ (Семянтоўскі-Курыла) Аляксандр Максімавіч (1821, Палтаўшчына, Украіна — 1893), бел. і рас. этнограф, археолаг, краязнавец. У 1860—90-я г. сакратар Віцебскага губернскага статыстычнага к-та, рэдактар неафіц. часткі «Витебских губернских ведомостей», пазней рэдактар «Памятнай кніжкі Віцебскай губерні». Аўтар прац па археалогіі, статыстыцы, побыту і культуры насельніцтва Віцебшчыны: «Статыстычнае апісанне Віцебскай губерні ў лясных адносінах» (1862), «Сінільна-набойная вытворчасць у Віцебску» (1864), «Пра кірмашы Віцебскай губерні» (1867), «Этнаграфічны агляд Віцебскай губерні» (1872), «Аб мерах і вазе, якія ўжываюцца ў Віцебскай губерні» (1874), «Беглы статыстычны нарыс прыроды і насельніцтва Віцебскай губерні» (1880), «Беларускія старажытнасці» (вып. 1, 1890). С. запісваў фальклорныя і ананімныя творы літ. паходжання («Рабункі мужыкоў»), звычаі, абрады. У пытаннях этнагенезу беларусаў прытрымліваўся вялікадзярж. поглядаў.

Літ.: Каханоўскі Г.А. Прадвесне навукі. Мн., 1990.

СЕМЯНЦО́Ў Міхаіл Іванавіч (26.9.1917, Кіеў — 12.2.1945), Герой Сав. Саюза (1943). Беларус. Скончыў Адэскую ваен. авіяшколу пілотаў (1940). У Чырв. Арміі з 1936. У Вял. Айч. вайну з 1941 на фронце. Удзельнік баёў у Данбасе, на Каўказе, Курскай дузе, Украіне, у Польшчы, Германіі. Нам. камандзіра эскадрыллі знішчальнага авіяпалка ст. лейтэнант С. да ліп. 1943 зрабіў 270 баявых вылетаў, удзельнічаў у 69 паветр. баях, збіў асабіста 12 і ў групе 9 самалётаў праціўніка; двойчы тараніў варожыя самалёты. Загінуў у баі.

СЕМЯНЬКО́Ў Уладзімір Нічыпаравіч (н. 20.3.1923, в. Стражэвічы Чашніцкага р-на Віцебскай вобл.), бел. філосаф і сацыёлаг. Д-р філас. н. (1981), канд. гіст. н. (1953), праф. (1982). Скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КПБ (1946), БДУ (1949). З 1949 у Бел. політэхн. ін-це (у 1980—86 заг. кафедры). У 1986—98 у Ін-це павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук пры БДУ. Навук. працы па праблемах грамадскага выхавання, суадносін матэрыяльных, ідэалагічных і духоўных фактараў у працэсе выхавання. Распрацаваў новыя канцэптуальныя і метадалагічныя падыходы да комплекснага вывучэння грамадскага выхавання як сінтэзу грамадскіх адносін і дзейнасці людзей.

Тв.: Производственный коллектив: труд, среда, воспитание. Мн., 1975; Комплексный характер воспитания. Мн., 1979; Формирование нового человека. Мн., 1982; Совершенствование социализма и общественное воспитание: Вопр. методологии и практики. Мн., 1986.

М.І.Семянцоў.

І.І.Семянюк.

СЕМЯНЮ́К Іван Іванавіч (15.2.1917, Мінск — 26.4.1973), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Батайскую ваен. авіяшколу пілотаў (1940). У Чырв. Арміі з 1938. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Паўд., Закаўказскім, Паўн.-Каўказскім, Варонежскім, 1-м Укр. франтах: камандзір звяна, эскадрыллі. Лётчык-знішчальнік капітан С. за час вайны зрабіў 430 баявых вылетаў, правёў 125 паветр. баёў, збіў 19 і ў групе 8 самалётаў праціўніка. Да 1961 у Сав. Арміі.

СЕМЯНЮ́ТА Мікалай Піліпавіч (н. 17.12.1929, с. Верхняя Хорціца Запарожскай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне электрасувязі. Канд. тэхн. н. (1966), праф. (1987). Скончыў Ленінградскі ін-т інжынераў чыг. транспарту (1957). З 1969 у Бел. ун-це транспарту (у 1971—81 і 1988—90 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах сетак і сістэм эл. сувязі, тэорыі эл. ланцугоў, мнагаканальнай сувязі і перадачы дыскрэтнай інфармацыі на чыгунцы.

Тв.: Автоматизированные рабочие места дистанций сигнализации и связи. М., 1994 (разам з Б.А.Макрыдзенкам, А.М.Семянютам); Перадача дискретной информации на железнодорожном транспорте. М., 1999 (разам з У.А.Кудрашовым).

СЕМЯНЯ́КА Людміла Іванаўна (н. 16.1.1952, С.-Пецярбург), расійская артыстка балета. Нар. арт. СССР (1986). Скончыла Ленінградскае харэагр. вучылішча (1970). З 1970 у Ленінградскім т-ры оперы і балета імя Кірава, з 1972 у Вял. т-ры ў Маскве. У 1991—92 у трупе «Нац. балет Вялікабрытаніі». Танцоўшчыца лірыка-драм. плана. Яе выкананне вылучаецца абвостранай эмацыянальнасцю, артыстызмам, чысцінёй выканаўчага стылю, віртуознай тэхнікай. Першая выканаўца партый Раксаны («Сірано дэ Бержэрак» М.Канстана), Соні Мармеладавай («Злачынства і кара» У.Пярта). Партыі класічнага і сучаснага рэпертуару: Адэта—Адылія, Аўрора («Лебядзінае возера», «Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Жызэль («Жызэль» А.Адана), Фрыгія («Спартак» А.Хачатурана), Джульета («Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева), Валянціна («Ангара» А.Эшпая). Знялася ў тэлефільмах «Харэаграфічныя навэлы» (1973), «Свет Уланавай» (1981). Яе творчасці прысвечаны тэлефільм-канцэрт «Танцуе Людміла Семяняка» (1979). Прэмія Г.Паўлавай (Парыж), 1-я прэмія Міжнар. конкурсу артыстаў балета (Токіо; абедзве 1976). Дзярж. прэмія СССР 1977.

СЕМЯНЯ́КА Юрый Уладзіміравіч (26.11.1925, Мінск — 16.7.1990), бел. кампазітар. Нар. арт. Беларусі (1974). Скончыў Бел. кансерваторыю (1957, клас А.*Багатырова*). У 1947—63 канцэртмайстар Дзярж. акад. харавой капэлы Беларусі. У яго творчасці пераважалі 2 асн. кірункі — муз. тэатр і песня. Музыцы С. ўласцівы лірызм, яркі меладызм, шчырасць выказвання; інтанацыйны склад грунтуецца на бел. нар. песеннасці і асаблівасцях сучасных масавых жанраў. Сярод твораў: оперы «Калючая ружа», «Калі ападае лісце», «Зорка Венера», «Новая зямля» (паст. ў Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі адпаведна ў 1960, 1968, 1970, 1982), аперэты «Рабінавыя каралі» (1964, паст. ў Бабруйскім муз.-драм. т-ры), «Пяе «Жаваранак» (1969, паст. ў Магілёўскім абл. т-ры муз. камедыі; 2-я рэд. 1971, паст. ў Дзярж. т-ры муз. камедыі Беларусі), «Паўлінка», «Тыдзень вечнага кахання»,

Л.Семяняка ў ролі Валянціны.

дзіцячая «Сцяпан — вялікі пан» (паст. ў т-ры муз. камедыі Беларусі адпаведна ў 1973, 1975, 1979), кантаты, у т.л. «Ясныя дарогі» (1957), «Памяці Канстанціна Заслонава» (1958), «Горад юнацтва»

Ю.У.Семяняка.

(1964), «Велічальная Мінску» (1967), «Зямля мая» ў 4 ч. (1979, для нар. хору і нар. арк.), «У вянок Максіму Багдановічу» (1980), сюіты «Родныя песні» (1979, для хору і нар. арк.) і інш. Аўтар шматлікіх песень, у т.л. «Ой, шумяць лясы зялёныя», «Беларусь — мая песня», «Люблю цябе, Белая Русь», «Расцвітай, Беларусь», «Явар і каліна», «Ты мне вясною прыснілася», «Не за вочы чорныя», «Журавіны», «Беларусачка» і інш. Значнае месца ў творчасці займалі харавыя творы (хары а капэла «Вы чулі, як плачуць дрэвы», паэма-рэквіем «Хатынскія званы», цыкл на словы Я.Коласа), вак. дуэты, трыо, квартэты, музыка да драм. спектакляў («Трэцяе пакаленне» паводле К.Чорнага, паст. ў Бабруйскім муз.-драм. т-ры, «Над хвалямі Серабранкі» І.Козела і «Залаты медаль» І.Шамякіна, паст. ў Бел. рэсп. т-ры юнага гледача, «Узнятая цаліна» паводле М.Шолахава, паст. ў Дзярж. рус. драм. т-ры імя М.Горкага, «Мурын бор» І.Ісачанкі, паст. ў Магілёўскім абл. драм. т-ры і інш.). Пісаў музыку да кінафільмаў «Каханнем трэба даражыць» (у сааўт.), «Песня нашай зямлі», «Веснавыя мелодыі», «Дарогі Беларусі» і тэлефільмаў («Плач перапёлкі»), радыёспектакляў і тэлепастановак. Апрацоўваў бел. нар. песні для хору а капэла, дзіцячага хору і інш. У 1978—80 старшыня праўлення Саюза кампазітараў Беларусі. Дзярж. прэмія Беларусі 1972.

Літ.: Жураўлёў Дз., Загародні Г. Юрый Семяняка. Мн., 1974. *А.Я.Ракава.*

СЕМЯХО́ВІЧЫ, возера ў Пінскім р-не Брэсцкай вобл., у бас. р. Піна, за 30 км на ПдЗ ад г. Пінск. Пл. 0,32 км^2, даўж. 750 м, найб. шыр. 520 м, найм. глыб. 7,5 м, даўж. берагавой лініі 2,1 км. Схілы катлавіны выш. да 1 м, разараныя, на Пн пад хмызняком. Берагі пясчаныя, высокія, на Пн забалочаныя, пад хмызняком. Больш за 50% дна выслана сапрапелем. На Пн сцёк з возера па каналe.

СЕ́НА, трава, скошаная і высушаная да вільготнасці 15—17% і ніжэй; адзін з асн. відаў *грубых кармоў* для жвачнай жывёлы ў стойлавы перыяд. Кармавая каштоўнасць С. залежыць ад яго бат. складу, месца росту травы (гл. *Сенажаць*), часу і спосабу яе ўборкі (гл. *Сенаўборка*), умоў захоўвання. Мае 6,5 — 20% пратэіну, 1—2% тлушчаў, 35—40% безазоцістых экстрактыўных рэчываў, 20—25% клятчаткі, 4—5% мінер. солей, каратын, вітаміны D, E, групы B. Найб. каштоўнае С. з бабовых (люцэрны, канюшыны, вікі, рутвіцы рагатай), злакавых траў (метлюжку лугавога, аўсяніцы лугавой, цімафееўкі лугавой, купкоўкі зборнай), разнатраўя (грэчкі птушынай, казлабароду лугавога і інш.). Малакаштоўнае С. з буйных асакі, сітняку, хвашчоў.

СЕ́НА (Seine), рака на Пн Францыі. Даўж. 776 км, пл. бас. 78,6 тыс. км^2. Вытокі на плато Лангр, цячэ ў шырокай даліне па раўнінах Парыжскага бас., рэчышча звілістае, асабліва ніжэй Парыжа. Упадае ў бухту Сены праліва Ла-Манш, утварае эстуарый. Асн. прытокі: Об, Марна, Уаза (справа), Іона, Эр (злева). Жыўленне пераважна дажджавое. Найб. ўзроўні зімой і ў канцы лета. Сярэдні расход вады ў Парыжы 250 м^3/с, каля вусця — да 500 м^3/с. У ніжнім цячэнні С. зазнае ўплыў марскіх прыліваў. Суднаходная ад г. Труа (часткова па абвадным каналe). Марскія судны падымаюцца да г. Руан (125 км ад вусця). Злучана каналамі з рэкамі Шэльда, Маас, Рэйн, Сона, Луара і інш. На С. — гарады Парыж (цягнецца ўздоўж С. амаль на 50 км), Руан; у эстуарыі марскі аванпорт Парыжа — Гаўр. Набярэжная С. ў Парыжы з помнікамі архітэктуры ўключана ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

СЕ́НА ДА СІ́ЛЬВА (Senna da Silva) Айртан (21.3.1960, г. Сан-Паўлу, Бразілія — 1.5.1994), бразільскі спартсмен (аўтамаб. гонкі). З 1981 у Вялікабрытаніі. У «Формуле-1» выступаў з 1984. Чэмпіён свету (1988, 1990, 1991), віцэ-чэмпіён (1989, 1993).

СЕНАЕ́ДЫ (Psocoptera, або Copeognatha), атрад насякомых. Больш за 1500 відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў тропіках і субтропіках. Жывуць у лясах



Сенаеды: 1 — амфігеронтыя кантаміната; 2 — хатняя, або пылавая вош; 3 — кніжная вош; 4 — каэцыліус флавідус.

на дрэвах, у гнёздах насякомых і птушак, на глебе, пад камянямі, у лясным подсцілe, жылых памяшканнях, бібліятэках, музеях. На Беларусі адзначаны кніжная вош (Liposcelis divinatorius), С. хатні, або пылавая вош (Trogium pulsatorium), С. двухпалосы (Amphigerontia bifasciata) і інш.

Даўж. цела 1—5 мм. Афарбоўка бледна-бурая, белая. Вусікі ніткападобныя. Ротавы апарат грызучы і сысучы. Большасць маюць перапончатыя бясколерныя або з цёмнымі плямамі і перавязямі крылы. У шэрагу відаў крылы ўкарочаныя ці адсутнічаюць. Ногі бегальныя, лапкі 2—3-члянікавыя. Развіццё з няпоўным ператварэннем. За год даюць некалькі пакаленняў. Кормяцца жывымі і адмерлымі раслінными тканкамі (адсюль назва), некат. грыбамі, водарасцямі, лішайнікамі, псуюць бат. і энтамалагічныя калекцыі, паперу, кнігі, сухія кармавыя запасы.

СЕНАЖА́ЦЬ, зямельныя ўгоддзі, травяністую расліннасць якіх скошваюць на *сена, сілас, сянаж, травяную муку*, зялёную падкормку. Падзяляюцца на сеяныя (культурныя) і прыродныя. Прыродныя С. падзяляюцца на заліўныя (поймавыя), нізінныя (забалочаныя) і сухадольныя.

Поймавыя заняты ў асн. злакавым разнатраўем і асаковай расліннасцю; нізінныя даюць сена сярэдняй і нізкай якасці з-за пераваг ў травастоі раслін з сям. асаковых; для сухадольных С. характэрны разнатраўна-злакавая і разнатраўна-асакова-злакавая асацыяцыі, сена з іх сярэдняй і добрай якасці. Для паляпшэння прыродных С. найб. значэнне маюць сістэм. ўнясенне ўгнаенняў, барацьба з пустазеллем, своечасовае правядзенне ўкосаў, чаргаванне тэрмінаў скошвання па гадах (увядзенне сенажацезваротаў).

СЕНАКО́СЦЫ (Opiliones, або Phalangida), атрад жывёл кл. павукападобных. 3 падатр., каля 4 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі найб. адзначаецца С. звычайны (Phalangium opilio). Жывуць у лясным подсцілe, пад карой дрэў, на сценах пабудоў, агароджах, паверхні глебы.

Даўж. цела 1—22 мм, авальнай формы, ад шэрага да чорнага колеру. Падобныя да *павукоў*, адрозніваюцца ад іх сегментаваным брушкам (9—10 сегментаў), якое злучана з галавагрудзямі шырокай асновай. Ногі тонкія, доўгія, лёгка адрываюцца (*аўтатамія*). Дыхаюць *трахеямі*. Кормяцца насякомымі, малюскамі, арган. рэшткамі.

СЕНАСТА́ЎКІ, сямейства млекакормячых атр. зайцападобных; гл. *Пішчухавыя*.

СЕНА́Т (лац. senatus ад senex стары), 1) у Старажытным Рыме адзін з вышэйшых дзярж. органаў улады. Узнік з савета старэйшых патрыцыянскіх родаў у канцы царскай эпохі (каля 6 ст. да н.э.), быў дзярж. саветам пры цару. У рэсп. перыяд (5—3 ст. да н.э.) улада С. была абмежавана на карысць *каміцый*. У час імперыі фармальна лічыўся вышэйшай дзярж. установай, яго ўлада была абмежавана імператарам. Пры Дыяклетыяне (канец 3 ст. н.э.) ператвораны ў дзярж. савет г. Рым, пры Канстанціне (4 ст.) С. створаны ў Канстанцінопалі, ураўнаваны ў правах з С. Ры-

ма. 2) У Рэчы Паспалітай дзярж. рада манарха і вышэйшая палата *сойма*. Узнік з С. Польскага каралеўства (склаўся да пач. 16 ст.) і *Рады Вялікага княства Літоўскага*. У 1569 у С. увайшлі ўсе ранейшыя польскія *сенатары*, прадстаўнікі Каралеўскай Прусіі і ўкр. зямель, далучаных да Польшчы; з ВКЛ — 2 біскупы (віленскі, жамойцкі), 9 ваяводаў (віленскі, троскі, смаленскі, полацкі, навагрудскі, віцебскі, брэсцкі, мсціслаўскі, мінскі), староста жамойцкі, 10 каштalянаў (віленскі, троскі, жамойцкі, смаленскі, полацкі, навагрудскі, віцебскі, брэсцкі, мсціслаўскі, мінскі), 5 вышэйшых ураднікаў дзяржавы, т.зв. міністраў — маршалак найвышэйшы (вялікі), канцлер, падканцлер, падскарбі земскі (вялікі) і маршалак надворны. У 1569 было 140 сенатарскіх пасад, пазней іх колькасць мянялася. С. разам з каралём (вял. князем) і Пасольскай Ізбой прымаў заканадаўчыя акты і інш. пастановы. Пазней былі ўведзены пасады сенатараў-рэзідэнтаў (з пач. 17 ст. выбіраліся 16 чал. на 2 гады, з 1641—28 чал.). У 1-й пал. 18 ст. вял. значэнне набылі рады С., склад якіх вызначаў кароль. Сенатары ўдзельнічалі таксама ў пасяджэннях соймавага суда. 3) У Расіі ў 1711—1917 правячы С. — вышэйшы дзярж. орган, падпарадкаваны імператару. Засн. Пятром I у 1711. Першапачаткова калегіяльны орган для кіравання дзяржавай у адсутнасць цара, замяніў *Баярскую думу*. З 2-й чвэрці 18 ст. правы С. абмяжоўвалі Вярхоўны тайны савет, потым Кабінет міністраў. У 1763 у выніку рэформы падзелены на *дэпартаменты*. З 1775 выконваў судовыя функцыі. Пасля заснавання міністэрстваў (1802) як вышэйшы судовы орган наглядаў за дзейнасцю дзярж. устаноў і чыноўнікаў. Паводле судовых статутаў 1864 С. — вышэйшая касацыйная інстанцыя. 4) Назва верхняй палаты парламента ў шэрагу сучасных дзяржаў (Бельгіі, Ірландыі, Італіі, Польшчы, Францыі, ЗША, Канады і інш.). У некат. краінах С. фарміруюцца шляхам прамых выбараў (Італія, Польшча), у інш. — прызначаюцца кіраўніком дзяржавы цалкам ці часткова. У шэрагу дзяржаў С. перавыбіраецца не поўнасцю, а часткова (напр., у ЗША кожныя 2 гады абнаўляецца 1/3 С.).

А.А.Радаман (С. Рэчы Паспалітай).

СЕНА́ТАР (лац. senator), 1) у Старажытным Рыме член *сената*, а з канца 1 ст. да н.э. таксама прадстаўнік вышэйшага саслоўя. Званне С. было пажыццёвым, у імператарскі час перадавалася ў спадчыну ці магло быць падаравана імператарам. 2) У Рэчы Паспалітай член дзярж. рады манарха і вышэйшай палаты *сойма*. 3) У Рас. імперыі і некат. сучасных дзяржавах член сената. Маюць тыя ж правы, што і дэпутаты ніжніх палат (гл. *Парламент*).

СЕНА́ТАРСКІЯ РЭВІ́ЗІІ, перыядычныя праверкі мясц. дзярж. апарата спец. прызначанымі сенатарамі ў Расіі 18 — пач. 20 ст. Уведзены Пятром I у 1722 як штогадовыя камандзіроўкі сенатараў у губерні і правінцыі. У 1-й пал. 18 ст. праведзены С.р. толькі Маскоўскай губ. (1726). Адноўлены ў 1760-я г., праводзіліся нерэгулярна (да 1799—15 Р.с.). Паводле ўказа Паўла I у 1799—1800 С.р. праведзены ўсіх губерняў, выяўлены шматлікія парушэнні ў мясц. кіраванні і судзе, самавольства чыноўнікаў, вял. колькасць нявырашаных спраў; паводле вынікаў С.р. сенат зняў некалькі дзесяткаў асабліва скампраметаваных чыноўнікаў. У 19 ст. рэвізаваны 53 губ., некат. з іх па некалькі разоў. С.р. ў пэўнай ступені стрымлівалі самавольства мясц. улад, іх вынікі разглядаліся ў сенаце і Савеце міністраў.

СЕНАЎБО́РАЧНЫЯ МАШЫ́НЫ, с.-г. машыны для ўборкі травы, нарыхтоўкі *сена* і *сенажу*.

У залежнасці ад спосабу *сенаўборкі* выкарыстоўваюцца: для скошвання травы — рознага тыпу *касілкі*; варушэння яе з мэтай больш хуткага высыхання — варушылкі (звычайна механічныя з шарнірнымі лемяшамі); зграбання сена ў валкі — *граблі*; падборкі сена з валкоў у копы — *падборшчыкі*, *валакушы*; транспарціроўкі копаў да месца сціртавання — капавозы (1 або 2 навясныя грабельныя рашоткі з механізмамі падымання і апускання, устаноўленыя на колавым трактары); укладкі сена ў стог і копаў на трансп. сродкі — *стагакіды*; прасавання сена ў цюкі (стандартныя, кароткамерныя, буйнагабарытныя) — *прэс-падборшчыкі*, падборшчыкі-ўкладчыкі цюкоў; загатоўкі здробненага сена — самаходныя і прычапныя камбайны, здробненае сена ад якіх дастаўляецца да месца дасушвання і захоўвання; прыгатавання травяной мукі, гранул і брыкетаў з зялёнай масы, што прывозіцца з поля — спец. памолачныя агрэгаты, гранулятары, брыкетавальнікі, інш. *кормапрыгатавальныя машыны* і спец. стацыянарныя тэхнал. лініі.

Літ.: Практикум по сельскохозяйственным машинам. Мн., 1997. *В.М.Кандрацьеў.*

1



2

Сенаўборачныя машыны: 1 — навясны універсальны капавоз КУН-10 (агрэгатуецца з трактарамі МТЗ); 2 — граблі-варушылка Л-503 («Лідсельмаш»).

СЕНАЎБО́РКА, комплекс працэсаў па прыгатаванні *сена*. Уключае скошванне, высушванне траў, укладванне сена на захоўванне. Травы скошваюць у перыяд, калі расліны маюць найб. колькасць пажыўных рэчываў (злакавыя травы ў перыяд калашэння, бабовыя — бутанізацыі). Вял. значэнне мае вышыня скошвання (завышэнне зрэзу травы на 1 см у параўнанні з аптымальным зніжае ўраджайнасць на 5—7%). Для паскарэння высушвання бабовыя травы плюшчаць. Скошваную траву правяльваюць у пракосах да 45—50% вільготнасці, пераварочваюць, згрэбаюць у валкі, складаюць у копы, сціртры. Пры запаволеным высушванні і паўторным намаканні сена страчвае ч. мінер. і арган. рэчываў, таму ўжываюць актыўнае вентыліраванне ці штучную сушку на сушыльных апаратах. Пры гэтым павялічваецца на 30% збор сена з 1 га, павышаецца колькасць у ім пратэіну на 7—10%, караціну на 20%. Гл. таксама *Сенаўборачныя машыны*.

СЕНБЕРНА́Р, бернардзінскі сабака, парода буйных дэкаратыўна-вартаўнічых сабак. Выведзена ў 13—14 ст. у Швейцарыі. Назва ад аднайм. кляштара (Швейцарскія Альпы), дзе яна выкарыстоўвалася для пошуку людзей у гарах.

Магутныя, маларухомыя сабакі грубай і рыхлай канстытуцыі. Вып. ў карку 65—70

Сенакосцы: 1 — звычайны; 2 — трагулюс акватыкус; 3 — немастома квадрыпунктата; 4 — ганілептус курвіпес.

см. Касцяк масіўны, мускулатура аб'ёмістая. Галава вял., шырокая. Вушы звіслыя. Скура рыхлая, утварае складку і адвісласці. Масць белая з рыжымі плямамі, рыжа-пярэстая розных адценняў. Грудзі, лапы, морда каля носа і канец шаблепадобнага хваста белыя. Даўгаці караткашэрсныя.

СЕ́НГЕР, Сангер (Sanger) Фрэдэрык (н. 13.8.1918, Рэндкамб, Вялікабрытанія), англійскі біяхімік. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1954). Ганаровы чл. Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1958). Д-р філасофіі (1943). Скончыў Кембрыджскі ун-т (1939). У 1944 у Мед. даследчым савеце, з 1951 кіраўнік аддзела хіміі бялку лабараторыі малекулярнай біялогіі Кембрыджскага ун-та. Навук. працы па вызначэнні структур малекул бялкоў і нуклеінавых к-т. Вызначыў хім. будову малекулы інсуліну і першасную структуру гена, які кадзіруе сінтэз інсуліну. Прапанаваў метад расшыфроўкі першаснай структуры ДНК, заснаваны на ферментатыўным сінтэзе высокарадыеактыўнай камплементарнай паслядоўнасці. Нобелеўскія прэміі 1958, 1980 (разам з П.Бергам і У.*Гілбертам*).

Ф.Сенгер.

СЕНГО́Р (Senghor) Леапольд Седар (н. 9.10.1906, г. Жааль, Сенегал), дзяржаўны дзеяч Сенегала, філосаф і паэт; піша на франц. мове. Чл. Французскай акадэміі (1983). Скончыў філал. ф-т Сарбоны. У 1935—39 і 1942—58 выкладаў у розных навуч. установах Францыі. У 2-ю сусв. вайну ў франц. арміі, у 1940 трапіў у ням. палон, адкуль уцёк у 1942. У 1936—48 чл. Франц. сацыяліст. партыі. У 1948 заснаваў Дэмакр. блок Сенегала (з 1959 — Прагрэсіўны саюз Сенегала), яго ген. сакратар. З 1945 дэпутат Устаноўчага сходу Францыі, у 1946—58 — Нац. сходу Францыі ад Сенегала. Актыўны дзеяч руху *панафрыканізму*, прапанаваў ідэю негрыцюду — своеасаблівасці афр. культуры. У 1959—60 старшыня Федэральнай асамблеі Федэрацыі Малі. З вер. 1960 прэзідэнт незалежнага Сенегала. Распрацаваў канцэпцыю «афр. сацыялізму», блізкую да ідэй еўрап. сацыял.-дэмакратыі. Ажыццяўляў палітыку супрацоўніцтва з краінамі Захаду і курс на пабудову рыначнай эканомікі. 31.12.1980 падаў у адстаўку з усіх дзярж. пасад. Аўтар шматлікіх паэтычных твораў, філас. прац.

Тв.: Рус. пер. — Песнь ночи и солнца: Избр. стихи. М., 1965; Избр. лирика. М., 1969.

Літ.: Ерасов Б.С. Леопольд Сенгор и его концепция культуры // Народы Азии и Африки. 1967. №2; Петрова Т.М. Поэзия Л.С.Сенгора как отражение его идейных исканий // Там жа. 1973. №4.

Сенбернар.

СЕНДА́Й, горад у Японіі на Пн в-ва Хонсю. Адм. ц. прэфектуры Міягі. Каля 1 млн. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аванпорт на Ціхім ак. — г. Сіогама. Аэрапорт. Прам-сць: нафтаперапр., эл.-тэхн., дрэваапр., электронная, тэкст., паліграф., харчовая. Саматужная вытв-сць маст. вырабаў. Ун-т. Горад-пабрацім Мінска (з 1973).

СЕ́НДЗЕР Ганна Мікалаеўна (н. 1.9.1959, г. Пінск Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне педагогікі і матэматыкі. Д-р пед. н. (2000). Скончыла Брэсцкі пед. ін-т (1983). З 1989 у Брэсцкім ун-це (з 2001 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах гісторыі і метадалогіі выкладання матэматыкі, фарміравання прафес. накіраванасці педагога, гуманітарызацыі адукацыі.

Тв.: Профессиональная направленность обучения в педучилище (из опыта работы). Мн., 1992; Научно-педагогические основы формирования профессиональной направленности студентов педвуза. Мн., 1998; Прафесіяналізацыя і гуманітарызацыя падрыхтоўкі педагога // Адукацыя і выхаванне. 2000. №5.

СЕН-ДЭНІ́ (Saint-Denis), горад у Францыі, на р. Сена, паўн. прамысл. горад-спадарожнік Парыжа. Засн. пры аднайм. абацтве ў 7 ст. Каля 110 тыс. ж. (2001). Трансп. вузел, порт на канале Сен-Дэні. Прам-сць: чорная металургія, аўта- і станкабудаўнічая, хім., шкляная, харчовая. Муніцыпальны музей гісторыі і мастацтва. Гатычны касцёл абацтва С.-Д. (12 ст.) — месца пахавання франц. каралёў.

СЕН-ДЭНІ́ (Saint-Denis), горад, адм. ц. востраваРэюньён (уладанне Францыі). На паўн. беразе в-ва. Засн. ў 1671. Каля 110 тыс. ж. (2001). Вузел аўтадарог, за 15 км ад порта Ле-Пор. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: харч. (у т.л. цукр. з-ды), тэкст., металаапрацоўчая. Вытв-сць сувеніраў. Ун-т. Музеі.

СЕНЕГА́Л (Sénégal), рака ў Зах. Афрыцы, у Гвінеі, Малі, Сенегале, Маўрытаніі. Пачынаецца ў горным масіве Фута-Джалон пад назвай Бафінг, пасля сутокаў з р. Бакой наз. С. Даўж. 1430 км (ад вытоку р. Бафінг), пл. бас. 441 тыс. км^2. У вярхоўях парожыстая, утварае вадаспады, ніжэй цячэ па раўніннай мясцовасці. Упадае ў Атл. акіян, утварае дэльту (пл. каля 1,5 тыс. км^2), у вусці пясчаны бар. Асн. прыток Фалеме. Сярэдні расход вады каля 1500 м^3/с. Выкарыстоўваецца для арашэння. ГЭС. Рыбалоўства. Суднаходная ў перыяд разводдзя ад г. Каес (785 км), пасля спаду вады — ад г. Падор (283 км). Гал. гарады: Каес (Малі), Каэды, Роса (Маўрытанія), Падор (Сенегал), у вусці марскі порт Сен-Луі (Сенегал).

СЕНЕГА́Л (Sénégal), Рэспубліка Сенегал (République du Sénégal), дзяржава на З Афрыкі. Мяжуе на Пн з Маўрытаніяй, на У — з Малі, на Пд — з Гвінеяй і Гвінеяй-Бісау. Тэр. краіны з З на У разразае тэр. дзяржавы Гамбія (утварае паўанклаў). На З краіна абмываецца Атл. акіянам. Пл. 196,2 тыс. км^2. Нас. 9987,5 тыс. чал. (2000). Дзярж. мова — французская, шырока распаўсюджаны мовы валоф і фульбе. Сталіца — г. *Дакар*. С. падзяляецца на 10 абласцей. Нац. свята — Дзень незалежнасці (4 крас.).

Дзяржаўны лад. С. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1963 (са зменамі). Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт, які выбіраецца на 7 гадоў. Заканад. ўлада належыць Нац. сходу (140 дэпутатаў) з тэрмінам паўнамоцтваў 5 гадоў. Палавіна складу парламента выбіраецца паводле прапарцыянальнай сістэмы, палавіна — паводле мажарытарнай. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе ўрад на чале з прэм'ер-міністрам, якога прызначае прэзідэнт.

Прырода. Паверхня — раўніна, нізінная на З, узгорыстая на У. На крайнім ПдУ — астанцовыя масівы (выш. да 581 м). З карысных выкапняў найб. значэнне маюць фасфарыты. Ёсць жал. руда, пяскі з ільменітам, рутылам і цырконам, буд. матэрыялы і інш. Клімат субэкватарыяльны. Сярэднія месячныя т-ры ад 23 °С (студз.) да 28 °С (ліп.). За год выпадае ад 250 мм ападкаў на Пн да 1500 мм на Пд. Дажджлівы сезон у ліп.—вер. на Пн, май — ліст. на Пд. Найб. рэкі Сенегал, Гамбія (вярхоўі) і Казаманс. Пераважае раслінасць саваннаў, на Пн — апустыненая, травяністая і хмызняковая, на Пд — з рэдкалессямі і групамі баабабаў. Па далінах рэк галерэйныя лясы, уздоўж ніжняга цячэння р. Казаманс лістападнавечназялёныя. У жывёльным свеце захаваліся антылопы, з драпежнікаў — шакал, гіена, леапард. Многа паўзуноў, з насякомых — муха цэцэ, тэрміты, камары. Мора багатае рыбай (тунец, сардзіны, макрэль) і вустрыцамі. Нац. паркі — Ніякола-Коба, Джудж (уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*), Дэльта Салума і інш.; ёсць заказнікі.

Насельніцтва. Каля 90% складаюць народы зах. бантоіднай групы — валоф (43%), фульбе (24%), серэр (15%), дыё-

ла (4%). На Пд і У жывуць мандынга, санінке, сусу (размаўляюць на мовах сям'і мандэ). У гарадах невял. групы еўрапейцаў і ліванцаў. Сярод вернікаў найб. мусульман (92%), ёсць паслядоўнікі мясц. анімістычных вераванняў (6%; на Пд), католікі (2%; у гарадах). Сярэднегадавы прырост насельніцтва 3,3% (1999). Сярэдняя шчыльн. 51 чал. на 1 км^2. Найб. шчыльна (да 100 чал. на 1 км^2) заселены раён Зялёнага Мыса на З, дзе знаходзіцца сталіца краіны г. Дакар з нас. 2079 тыс. ж. (2000). Гарадское

Герб і сцяг **Сенегала**.

насельніцтва складае 47%, акрамя сталіцы толькі ў гарадах Каалак, Тыес, Сен-Луі, Дыўрбель, Зігіншор і Руфіск перавышае 100 тыс. ж. У сельскай гаспадарцы занята 60% насельніцтва. Значная эміграцыя, пераважна ў Францыю.

Гісторыя. Паселішчы чалавека на тэр. С. вядомы з часоў ніжняга палеаліту. З 9 ст. тут жылі народы тукулер, валоф, фульбе; тэр. С. ўваходзіла ў склад дзяржаў *Гана*, *Малі*, *Сангаі*. У 15 ст. з'явіліся еўрапейцы (з 1446 партугальцы, у 16 ст. іх выцеснілі галандцы), якія гандлявалі рабамі. У 17 ст. С. каланізаваны французамі (у 1659 засн. г. Сен-Луі). Да 1854 абвешчаны франц. калоніяй, але поўнасцю завяваваны французамі ў 1879—90. Эканам. цэнтрам калоніі быў г. Дакар (засн. ў 1857). У 1848—51 і з 1871 краіна мела сваіх дэпутатаў у Нац. сходзе Францыі (уласна афрыканцаў з 1914). У франц. калан. войсках у Афрыцы служылі сенегальскія стралкі. З 1895 С. — частка Франц. Зах. Афрыкі. У 2-ю сусв. вайну да 1943 пад уладай франц. прагерм. ўрада «Вішы», потым адна з апорных баз антыгітлераўскай «Змагарнай Францыі». У 1946 С. атрымаў статус заморскай тэр. Францыі, у 1957 — унутр. аўтаномію. Вядучай паліт. сілай краіны з 1958 быў Прагрэс. саюз С. (ПСС). З 1958 С. аўтаномная рэспубліка ў складзе франц. Супольнасці. У 1959 ён аб'яднаўся з Франц. Суданам у Федэрацыю Малі (з 20.6.1960 незалежная, 20.8.1960 распалася).

5.9.1960 С. стаў незалежнай рэспублікай на чале з прэзідэнтам Л.С.*Сенгорам* (ген. сакратар ПСС). Пасля адхілення ад улады апазіцыйна настроенага кіраўніка ўрада М.Дыя (у 1962—74 зняволены) Сенгор адначасова быў і прэм'ер-міністрам краіны (1962—70). У дзяржаве будаваўся «дэмакр. афр. сацыялізм» (спробы сумясціць афр. традыцыі і каштоўнасці індустр. грамадства). З 1966 існаваў аднапарт. рэжым ПСС (з 1976 наз. Сацыяліст. партыя), які ў знешняй палітыцы арыентаваўся на Францыю. У 1974 дазволена дзейнасць інш. партый, у т.л. Дэмакр. партыі С. (ген. сакратар А.Вад). Пры пераемніку Сенгора А.Дыуфу (з 1983 прэзідэнт, у 1983—91 адначасова і прэм'ер-міністр С.) у краіне паглыбіліся паліт. і сац.-эканам. пераўтварэнні, палепшаны адносіны з Анголай і Эфіопіяй. У 1982—89 С. разам з Гамбіяй утвараў канфедэрацыю *Сенегамбія*. У 1988 адбыліся міжэтн. хваляванні на памежжы С. і Маўрытаніі, з 1990 унутры краіны ўзнік канфлікт вакол пытання незалежнасці паўд. правінцыі Казаманс. У сак. 2000 прэзідэнтам С. выбраны Вад. С. — чл. ААН (з 1960), Арг-цыі афр. адзінства. Дзейнічаюць Сацыяліст. партыя, Дэмакр. партыя С., інш. партыі і рухі.

Гаспадарка. С. — эканамічна слаборазвітая краіна з параўнальна развітымі сельскай гаспадаркай, рыбалоўствам і гарнаруднай прам-сцю. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) на 1 чал. за год 1600 дол. (2000). Сельская гаспадарка дае 19% ВУП, прам-сць 17%, абслуговыя галіны 64%. Пасля завявання незалежнасці разам з прыцягненнем замежнага (пераважна французскага) і нац. прыватнага капіталу ўрад імкнецца расшырыць дзярж. сектар. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваюць каля 2,4 млн. га зямлі пад ворыва і шматгадовыя насаджэнні, каля 3,2 млн. га пад натуральную пашу (саванны і саванныя лясы). Каля 80 тыс. га зямлі арашаецца. Гал. ролю адыгрывае земляробства. Землеўладанне пераважна абшчыннае, у найб. развітых зах. раёнах прыватнае, значная частка сялян арандатары; ёсць збытавыя кааператывы і дзярж. плантацыі. Каля 50% ворных зямель занята пад арахіс (штогадовы збор 700—900 тыс. т, адно з першых месцаў у свеце). Асн. раён вырошчвання арахісу — зах. і цэнтр. ч. краіны. На ўласныя патрэбы вырошчваюць проса і сорга (паўсюдна), маніёк і рыс (на Пн у нізоўях р. Сенегал, на Пд у бас. р. Казаманс), батат, кукурузу, агародніну. Новыя культуры — цукр. трыснёг і бавоўнік. Таварнае пладаводства і агародніцтва ў раёне г. Дакар. Алейная пальма і бананы распаўсюджаны на Пд. На Пн у саваннах — збор камедзі з дзікарослай акацыі. Жывёлагадоўля адгонна-пашавая і ў меншай ступені качавая, малапрадукцыйная, найб. развіта на Пн і ПнУ. Пагалоўе (1997, млн. галоў): буйн. раг. жывёлы (на Пн — зебу, на Пд — буйвалы) 2,96, авечак 4,3, коз 3,6, свіней 0,33. Гадуюць таксама коней (каля 200 тыс.), аслоў (каля 200 тыс.), вярблюдаў (каля 6 тыс.). Развіта птушкагадоўля (у 1997—45 млн. курэй). Расце значэнне марскога рыбалоўства. У 1999 вылаўлена 507 тыс. т рыбы. Тунцовыя кансервы і свежамарожаная рыба экспартуюцца ў Еўропу, сушаная, вяленая і салёная — у краіны Экватарыяльнай Афрыкі. Развіты вустрычны промысел. Гал. цэнтры рыбалоўства і рыбаперапрацоўкі Дакар, Руфіск, Жааль, Сен-Луі. Найб. развіты харч. і харчасмакавая прам-сць. Працуюць прадпрыемствы па перапрацоўцы арахісу і атрыманні арахісавага алею

Да арт. **Сенегал** (дзяржава). У далі-не р. Сенегал.

(адно з вядучых месцаў у свеце), мукамольныя, піваварныя, цукр., тытунёвыя, мылаварныя. Развіта тэкст. прам-сць (бавоўнаачышчальны з-д у г. Тамбакунда, 3 тэкст. ф-кі ў Дакары, камбінат у г. Тыес) і гарбарна-абутковая (ф-ка ў г. Руфіск). Ёсць прадпрыемствы па металаапрацоўцы (у асн. для гарнаруднай прам-сці і сельскай гаспадаркі), па зборцы аўтамабіляў і лёгкіх самалётаў, цэм., лесапільныя, мэблевыя, запалкавыя. У Мбао каля г. Руфіск нафтаперапр. і мінер. угнаенняў з-ды, у г. Дакар суднабудаванне і суднарамонт, ліцейная вытв-сць у г. Тыес і інш. Здабыча фасфарытаў (больш за 2 млн. т штогод, асн. радовішчы Тайба і Пало каля г. Тыес), мармуру, інш. буд. матэрыялаў, солі з марской вады (каля г. Каалак). Энергетыка засн. на імпартуемай нафце. Асн. ЦЭС у Дакары і суседніх гарадах (каля 90% агульнай магутнасці). У 1998 атрымана 1,2 млрд кВт·гадз электраэнергіі. Развіты саматужныя промыслы (ганчарны, выраб цыновак, маст. рэчаў і сувеніраў, ювелірных упрыгожанняў, мэблі, драўлянага посуду і інш.). Транспарт аўтамаб., чыг., марскі. У С. 14,6 тыс. км аўтадарог, з іх 4,3 тыс. км з цвёрдым пакрыццём, 110 тыс. легкавых аўтамабіляў, 50 тыс. грузавых і аўтобусаў; 0,9 тыс. км чыгункі (найб. важная лінія перасякае краіну з З на У і далей да р. Нігер у Малі), 0,9 тыс. км унутр. водных шляхоў (выкарыстоўваюцца пераважна ў перыяд дажджоў, у т.л. 785 км па р. Сенегал). Гал. марскія парты Дакар (каля 70% экспарту і імпарту С., абслугоўвае Малі і інш. краіны Зах. Афрыкі), Сен-Луі (экспарт фасфарытаў), Каалак, Зігіншор. 20 аэрапортаў, у т.л. міжнар. каля Дакара. У 1998 экспарт склаў 925 млн. дол., імпарт 1,2 млрд. дол. У экспарце пераважаюць арахіс і прадукты яго перапрацоўкі (больш за 50%), рыба і рыбапрадукты, фасфарыты, нафтапрадукты, бавоўна; у імпарце — харч. і прамысл. тавары, машыны і металы, паліва. Гал. гандл. партнёры: Францыя (20% экспарту, 36% імпарту), інш. краіны Зах. Еўропы, суседнія краіны, Індыя, ЗША, Кітай. Замежны турызм (штогод каля 500 тыс. замежных турыстаў, турысцкі сезон у сухі зімовы перыяд) прыносіць даход у 160—200 млн. дол. Краіна атрымлівае эканам. дапамогу пераважна ад Францыі. Грашовая адзінка — франк КФА.

Літ.: Кашин Ю.С. Сенегал. М., 1973; Кузнецов Л.М. На самой западной точке Африки: Дакар. М., 1980.

І.Я.Афнагель (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *В.У.Адзярыха* (гісторыя).

СЕНЕГА́МБІЯ (Senegambia), 1) пашыраная назва раёна Зах. Афрыкі ў міжрэччы Сенегала і Гамбіі з 1-й пал. 17 ст., калі еўрапейцы пачалі пранікненне ўглыб афр. кантынента. 2) Канфедэрацыя Сенегала і Гамбіі ў 1982—89. Прэзідэнтам С. быў прэзідэнт Сенегала, віцэ-прэзідэнтам — Гамбіі; існавалі канфедэратыўныя савет міністраў, парламент і суд. Аднак супярэчнасці паміж Сенегалам і Гамбіяй прывялі да распаду канфедэрацыі.

СЕ́НЕКА Луцый Аней (Lucius Annaeus Seneca; каля 4 да нр.э., г. Кордава, Іспанія — 65 н.э.), старажытнарымскі філосаф, пісьменнік і дзярж. дзеяч. У 49—54 выхоўваў *Нерона*, пасля ўзыходу якога на прастол у 54 аказваў уплыў на праўленне імперыяй. Абвінавачаны Нероном у змове супраць імператара і па яго загадзе скончыў жыццё самагубствам. Філасофія С. эклектычная: заснавана на сінтэзе *стаіцызму* і вучэнняў *Эпікура*, *кінікаў* і інш. У асн. філас. працах «Маральныя лісты да Луцылія», «Аб дабрадзействах», «Аб міласэрнасці» прапанаваў праграму маральнага самаўдасканалення асобы, дасягнення стану незалежнасці ад знешніх абставін. Лічыў, што для дасягнення асабістага шчасця неабходна валодаць маральнай мудрасцю і такімі якасцямі, як пагарда да смерці і ўстрыманне. Прызнаваў наяўнасць дабратворнай божай волі і лічыў пакуты чалавека пры выпрабаваннямі Бога. Адстойваў ідэю роўнасці ўсіх людзей, у т.л. і рабоў. Верыў у бязмежны прагрэс чалавечых ведаў. У аснове натурфілас. поглядаў С. вучэнні стоікаў пра цялеснасць усяго існага і сусв. пажар як пакаранне за зямное зло. Яго светапогляд адлюстраваны ў 9 трагедыях («Медэя», «Эдып», «Фіест», «Федра», «Геркулес Вар'яцкі», «Агамемнан», «Траянкі», «Фінікіянкі», «Геркулес Этэйскі») на міфалагічныя сюжэты, дзе праводзіў думкі аб згубнасці моцных пачуццяў, вар'яцкім сваволстве дэспаты, смерці як сродку выратавання ад зямнога зла. Трагедыі С. паўплывалі на далейшае развіццё драматургіі (У.Шэкспір, франц. класіцызм). На Беларусі ідэі С. развівалі Ф.Скарына, М.Гусоўскі, С.Будны, Сімяон Полацкі і інш. Сугучныя С. ідэі выказвалі Г.Каніскі, які прызнаваў магчымасць дасягнення шчаслівага жыцця на зямлі, М.К.Сарбеўскі, С.Лаўксмін, Т.Брылевіч, якія гал. задачу філасофіі бачылі ў фарміраванні высокамаральнай асобы.

Тв.: Рус. пер. — Трагедии. М., 1991; Нравственные письма к Луцилию. М., 2000.

Т.І.Адула.

СЕН-ЖОН ПЕРС [Saint-John Perse; сапр. Л е ж э (Léger) Алексі; 31.5.1887, в-аў Гвадэлупа, Францыя — 20.9.1975], французскі паэт, дыпламат. Атрымаў адукацыю ў Бардо і Парыжы. У 1916—40 на дыпламатычнай рабоце. Друкаваўся з 1909. У творчасці імкнуўся да эпічнасці, нац. традыцый. Форма верша С.-Ж.П. — версэ (верш, які запісваўся прозай і пабудаваны ў духу традыц. франц. метрыкі). Апяваў свет прыроды, нац. традыцыі Усходу (паэма «Анабасіс», 1924). Адзін з натхняльнікаў Руху Супраціўлення ў 2-ю сусв. вайну (цыклы вершаў «Выгнанне», 1942; «Вятры», 1946). У паэмах «Арыенціры» (1957), «Птушкі» (1963), «Песня раўнадзенства» (1971), «Засуха» (1974) і інш. абарона актыўнай грамадз. пазіцыі, пошукі шляху ў аднаўленні нац. велічы Францыі. Нобелеўская прэмія 1960.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1996.

Літ.: Балашов Н.И. Сен-Жон Перс // История французской литературы. М., 1963. Т.4.

Сен-Жон Перс.

СЕН-ЖУСТ (Saint-Just) Луі Антуан Леон дэ (25.8.1767, г. Дэсіз, Францыя — 28.7.1794), дзеяч *французскай рэвалюцыі 1789—99*, паплечнік М.*Робесп'ера*. Вывучаў права ў Рэймсе. У 1792 выбраны ў *Канвент*, дзе далучыўся да *якабінцаў*. Удзельнічаў у распрацоўцы праекта якабінскай канстытуцыі 1793. Быў членам К-та грамадскага выратавання, гал. абвінаваўцам *жырандзістаў*, *эбертыстаў* і дантаністаў. Паводле прапановы С.-Ж. Канвент прыняў 10.10.1793 рашэнне пра стварэнне рэв. ўрада. У якасці камісара Канвента знаходзіўся ў Рэйнскай (канец 1793) і Паўночнай (лета 1794) арміях, садзейнічаў рэарганізацыі рэв. узбр. сіл. Па яго ініцыятыве Канвент прыняў Вантозскія дэкрэты (1794), якія прадугледжвалі канфіскацыю маёмасці ў асоб, прызнаных ворагамі рэвалюцыі, і размеркаванне яе паміж немаёмнымі патрыётамі. У працы «Фрагменты аб рэспубліканскіх установах» (выд. ў 1800) прапанаваў праект арганізацыі грамадства, пабудаванага на прынцыпах бурж. дэмакратыі. Пасля *Тэрмідарыянскага пераварота* пакараны смерцю на гільяціне.

СЕН-ЖЭРМЕ́НСКІ МІ́РНЫ ДАГАВО́Р 1919, адзін з дагавораў, падпісаны дзяржавамі-пераможцамі (ЗША, Вялікабрытаніяй, Францыяй, Італіяй, Японіяй і інш.) у 1-й сусв. вайне 1914—18 з Аўстрыяй 10 вер. ў г. Сен-Жэрмен-ан-Ле (каля Парыжа). Дагавор зафіксаваў распад Аўстра-Венгерскай імперыі пасля паражэння ў вайне і стварэнне на яе тэр. шэрагу самастойных дзяржаў: Аўстрыйскай рэспублікі, Венгрыі, Чэхаславакіі і Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 — Югаславія). Паводле дагавора Аўстрыі забаронена мець ваен. авіяцыю і ваен. флот, аб'яднанне з Германіяй; армія абмяжоўвалася колькасцю ў 30 тыс. чал. Аўстрыя абавязалася выплачваць рэпарацыі. Частка зямель імперыі перададзена Італіі (Паўд. Ціроль). Паўн. Букавіна — Румыніі, Закарпацце — Чэхаславакіі. С.-Ж. м.д. адлюстраваў змены ў Еўропе, што адбыліся ў выніку распаду Аўстра-Венгрыі. Разам з тым яго ўмовы, навязаныя

дзяржавамі Антанты, стваралі падставы для міжнар. і міжнац. канфліктаў. *Аншлюс* Аўстрыі ў 1938 і інш. акты фаш. агрэсіі напярэдадні і ў час 2-й сусв. вайны 1939—45 азначалі гвалтоўную ліквідацыю ўмоў С.-Ж.м.д. і звязаных з ім інш. дагавораў *Версальска-Вашынгтонскай сістэмы*.

СЕ́НІЁР (Senior) Насаў Уільям (26.9.1790, г. Комптан, Вялікабрытанія — 4.6.1864), англійскі вучоны-эканаміст. Скончыў юрыд. ф-т Оксфардскага ун-та (1815), у 1825—30 і 1847—52 праф. эканомікі у гэтым ун-це. Працаваў у шэрагу ўрадавых камісій па пытаннях працы ў прам-сці. Гал. твор — «Асноўныя пачаткі палітычнай эканоміі» (1836). Аўтар тэорыі «ўстрымання», паводле якой прыбытак з'яўляецца ўзнагародай за адмаўленне ад расходавання сродкаў на непрадукц. мэты. Аналізуючы сцвярджэнні Р.Мальтуса, даказваў, што рост дабрабыту павінен аўтаматычна забяспечваць кантроль росту насельніцтва.

СЕ́НІЦА, Сенніца, вёска ў Мінскім р-не, на аўтадарозе Мінск—Слуцк. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 2 км на Пд ад ускраіны Мінска, 3 км ад чыг. ст. Калядзічы. 2035 ж., 601 двор (2001). *Мінскі аграрна-камерцыйны каледж*, сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, паліклініка, аптэка, дом быту, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік архітэктуры — Свята-Петрапаўлаўская царква (1861—65).

Вядома з 1567 як сяло. Уласнасць Ж.С.Драгачовіча, С.І.Дастаеўскага, П.Р.Горскага, К.Друцкага-Горскага, Паўлікоўскага, Тарчынскіх. З 1791 цэнтр маёнтка Каралішчавіцкай парафіі. З 1793 у Рас. імперыі. У 1861 вёска С. — цэнтр Сеніцкай вол. Мінскага пав. У 1897 — 253 ж., 35 двароў, 2 царквы, нар. вучылішча, дзе ў 1889—90 вучыўся *Я.Купала*; у маёнтку 84 ж. З 1924 цэнтр сельсавета Самахвалавіцкага р-на, з 1931 у падпарадкаванні Мінскага гарсавета, з 1935 у Мінскім р-не.

СЕН-КАНТЭ́Н (Saint-Quentin), горад на Пн Францыі, на р. Сома і Сен-Кантэнскім канале. Вядомы да н.э., стараж. гальскі горад. Каля 100 тыс. ж. (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог, рачны порт. Прам-сць: баваўняная (адзін з гал. цэнтраў краіны), эл.-тэхн., трансп. машынабудаванне. У раёне С.-К. — маст. промыслы (выраб карункаў, гардзін, бялізны). Маст. музей.

СЕ́НКАЎ, ручай у Бабруйскім р-не Магілёўскай вобл., левы прыток р. Бабруйка (бас. р. Дняпро). Даўж. 21,6 км. Пачынаецца на паўн.-зах. ускраіне г. Бабруйск, вусце за 500 м на У ад в. Заціша. Рэчышча перад вусцем на працягу 7,7 км каналізаванае.

СЕН-ЛЕО́Н (Saint-Léon) Арцюр [сапр. Мішэль (Michel) Шарль Віктор Арцюр; 17.9.1821, Парыж — 2.9.1870], французскі танцоўшчык, балетмайстар, педагог, скрыпач. Вучыўся танцу ў бацькі — Л.Мішэля, ігры на скрыпцы — у Н.*Паганіні*. Дэбютаваў як танцоўшчык у Мюнхене (1835). З 1837 гастраліраваў у краінах Еўропы. Бліскуча выконваў класічныя і характарныя партыі. Яго танец адметны элегантнасцю і тонкім густам, пластычнай арнаментыкай і глыбокім зместам. У 1847 выступіў у Парыжы ў «Гранд-апера» як харэограф і выканаўца (балет «Мармуровая прыгажуня» Ц.Пуні). З 1854 балетмайстар у Лісабоне, з 1859 гал. балетмайстар у Пецярбургу і пастаянна працаваў у Маскве. Сярод яго пастановак найб. вядомы балеты на музыку Пуні («Скрыпка д'ябла», паст. 1849; «Грацыэла», паст. 1860; «Сірата Тэалінда», паст. 1862), Л.Мінкуса («Фіямета», паст. 1864), Л.Дэліба («Ручай», паст. 1866; «Капелія», паст. 1870) і інш. Стваральнік арыгінальнай сістэмы запісу танца — «Сценахарэаграфія».

Літ.: Красовская В. Русский балетный театр второй половины XIX в. Л.; М., 1963. *С.В.Гуткоўская.*

СЕН-МАЛО́ (Saint-Malo), заліў праліва Ла-Манш каля паўн. берагоў Францыі паміж п-вамі Брэтань і Катантэн. Даўж. 110 км, шыр. каля ўвахода да 125 км, глыб. да 51 м. Прылівы паўсутачныя (да 15 м). Упадае р. Ранс, у вусці якой прыліўная эл.-станцыя (пабудавана ў 1967). Парты: Гранвіль, Сен-Мало.

СЕ́ННА, род кветкавых раслін, тое, што *касія*.

СЕ́ННАЯ ПА́ЛАЧКА (Bacillus subtilis), спараўтваральная бактэрыя сям. бацыл. Пашырана ў глебе, на раслінных рэштках, у паветраным пыле. Часам выклікае псаванне харч. прадуктаў.

Клеткі палачкападобнай формы, грамстаноўчыя, рухомыя. *Аэробныя арганізмы; сапратрофы*, раскладаюць арган. рэчывы (вугляводы, бялкі). Непатагенныя. Выдзяляюць з настою сена (адсюль назва). Выкарыстоўваюць у мікрабіял. і малекулярна-генет. даследаваннях, у біятэхналогіі.

СЕ́ННЕНСКА-АРША́НСКАЯ ПАРТЫЗА́НСКАЯ ЗО́НА, тэрыторыя на Пд Віцебскай вобл. ў міжрэчы Зах. Дзвіны, Дняпра, Улы, Лукомкі, Бабра, якую кантралявалі партызаны ў Вял. Айч. вайну. Склалася да жн. 1942, уключала да 70% Аршанскага, Сенненскага, Багушэўскага і Талачынскага р-наў. Да вер. 1943 займала пл. каля 1500 км². Абаранялі зону 13 партыз. брыгад (каля 12 тыс. чал.), таксама спецгрупы, закінутыя з Вял. зямлі. Кіраўніцтва абаронай і ўнутр. жыццём зоны ажыццяўлялі БШПР, падп. Віцебскі абком КП(б)Б, Аршанскія, Багушэўскія, Дубровенскія, Сенненскія, Талачынскія райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ. Выдаваліся падп. раённыя газеты. Партыз. фарміраванні зоны ўзаемадзейнічалі з падпольшчыкамі Оршы, Віцебска, пас. Асінторф і інш., у складаныя перыяды барацьбы з карнікамі на дапамогу ім прыходзілі партыз. фарміраванні Магілёўшчыны. Гітлераўцы неаднаразова спрабавалі ліквідаваць зону, правялі 8 карных аперацый, у час апошняй ворагу ўдалося пацясніць абаронцаў зоны, але пачатак *Беларускай аперацыі 1944* перашкодзіў яму выкарыстаць перавагу. У памяць аб баявых дзеяннях фарміраванняў зоны пастаўлены помнікі ў месцах іх базіравання, на брацкіх магілах партызан. *У.С.Пасэ.*

СЕ́ННЕНСКАЕ ВО́ЗЕРА, другая назва воз. *Сянно*.

СЕ́ННЕНСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў 1941—44 на тэр. Сенненскага р-на Віцебскай вобл. пад кіраўніцтвам Сенненскіх падп. райкомаў ЛКСМБ і КП(б)Б. У 1943 налічвала 40 арг-цый і груп (170 чал.): 7 груп у г. Сянно (кіраўнікі Ф.Я.Кудрашоў, А.Я.Ушацкая, Э.К.Гарнакова, Н.Крылова), у вёсках Асінаўка (М.П.Бараноўскі, Я.Г.Кучка, Л.П.Бараноўская), Буй (Радкевіч), Буйнічкава (Я.Магера), Бурбін (Л.І.Сяліцкі, Ф.Аўдзееў), Відокі (М.М.Каламеец), Воўсішча (Н.Куляшова, Г.У.Ляхоўская), Вял. Сяло (М. і В.Красоўскія), Вял. Азярэцк (В.Тарасевіч), Гарывец (Н.С.Валадкевіч), Дубнякі (В.Ляўко), Замошша (У.Радкевіч, А.Фіткевіч), Кажамякі (М.Шаўлік), Каміншчына (А.Марцінкевіч), Капланы (І.Ф.Дунец), Клімавічы (Л.Мізаўцова), Курэйшына (А.П.Лявонаў), Латыгаль (В.П.Карпушэнка), Лук'янава (І.Глякаў), Малешы (К.Кандрашоў), Маргойцы (Р.Пракаповіч, Г.Гаралёва), Міхалполле (М.Б.Гарнявецкі), Міцюкова (І.Казырэўскі), Новая Беліца (П.Васільеў, У.Рачонак, Д.Бурак), Нямойта (М.Гутарэвіч, Т.Зайцаў, Н.Занько), саўгас «Полымя» (Г.У.Ляхоўская, А.Хадорык), Поўзікі (Н.С.Валадкевіч, В.К.Шыдлоўская), Прыветак (Л.С.Кацар, М.Дзмітраковіч), Пурплева (І.Жагула), Расходнава (П.Лябецкі, Н.Юрша), Рудніца (М.Тамашэўскі, М.Воранаў), Савінічы (А.І.Стук, Р.М.Латышава), Сукрамна (Н.Мяцеліца), Сычова (М.В.Тарасевіч), Тухінка (Л.Яроменка), Ульянавічы (У.М.Бяляеў, П.В.Кацар, В.С.Блажкоў, У.Скапа, М.Дольскі) і інш. Падпольшчыкі распаўсюджвалі сярод насельніцтва зводкі Саўінфармбюро, збіралі і перадавалі партызанам зброю, боепрыпасы, медыкаменты, вопратку, разведданыя, праводзілі дыверсіі. Пад іх уплывам адбыўся масавы пераход паліцэйскіх у партызаны. З набліжэннем фронту падпольшчыкі далучыліся да партызан. *В.В.Бандарэвіч.*

СЕ́ННЕНСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1918. Адбылося 8—10 жн. як працяг *Аршанскага паўстання 1918*; найб. арганізаванае ў ланцугу *леваэсэраўскіх мяцяжоў 1918*. Кіравала паўстаннем мясц. арг-цыя левых эсэраў на чале з А.Закрэўскім. У ім удзельнічалі чырвонаармейцы 2-га Смаленскага і Стайкаўскага палкоў, якія паходзілі з мясц. сялян і гал. задачай лічылі барацьбу супраць ням. акупантаў. У пач. жніўня пав. з'езд саветаў, дзе большасць належала эсэрам, прыняў рэзалюцыю аб непадпарадкаванні сенненскіх саветаў сав. ўраду. Непасрэдным повадам да паўстання паслужы-

ла спроба чырв. камандавання змяніць камандзіра 2-га Смаленскага палка (эсэр Дз.Ф.*Прышчэпаў*), які дыслацыраваўся ў зоне дэмаркацыйнай лініі за 10 км ад Сянно. Паўстанне задушыў сфарміраваны спецыяльны атрад на чале з В.Даўбэ з дапамогай 1-га Латышскага кавалерыйскага палка.

Літ.: Дзядзенка З. Аршанскае й сенненскае паўстаньні // Спадчына. 1999. №4.

Н.І.Стужынская.

СЕ́ННЕНСКІ КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Засн. ў 1995, адкрыты ў 1996 у г. Сянно Віцебскай вобл. Пл. экспазіцыі 247 м^2, 1 тыс. экспанатаў асн. фонду (2000). Сярод экспанатаў зуб маманта, крамянёвыя і каменныя прылады працы (2-е тыс. да н.э.), фрагменты паліванай керамікі 16—17 ст., калекцыі манет ВКЛ, Рэчы Паспалітай і Рас. імперыі, прадметы сял. побыту, ганчарны посуд, вырабы ткацтва, вышыванкі канца 19 — пач. 20 ст., матэрыялы пра дзейнасць падполля і партыз. рух на Сенненшчыне ў Вял. Айч. вайну. У экспазіцыі творы землякоў мастака У.*Гоманава* і скульптара З.*Азгура*. Музей праводзіць выстаўкі твораў мясц. мастакоў і майстроў дэкар.-прыкладнога мастацтва.

В.В.Бандарэвіч.

СЕ́ННЕНСКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка на Беларусі з канца 18 ст. да пач. 1923. Утвораны 22.7.1773 у складзе *Аршанскай правінцыі*, з 22.3.1777 Магілёўскай губ. Цэнтр. — г. *Сянно*. У 1795 у С.п. перададзена частка тэрыторыі, далучанай у выніку 2-га падзелу Рэчы Паспалітай, з мяст. Лукомль і Чарэя. 12.12.1796 павет уключаны ў Беларускую губ. З 27.2.1802 зноў у Магілёўскай губ. з аднаўленнем межаў 1795. Пл. С.п. 3,3 тыс. км^2. У 1861 далучана частка скасаванага Копыскага пав., пасля чаго пл. стала 4,9 тыс км^2. Тэр. С.п. была падзелена на 15 валасцей. У 1864 нас. павета 85,5 тыс. чал. У 1881 у С.п. (без г. Сянно) было 67 прадпрыемстваў, на якіх працавала 198 чал. У 1883 у 2 школах і 17 нар. вучылішчах навучалася 637 вучняў; былі 4 бальніцы на 72 ложкі, 2 аптэкі. На 1889 у павеце 786 паселішчаў, у 1897 161,7 тыс. чал., з іх у Сянне 4,1 тыс. З 26.4.1919 С.п. у складзе Віцебскай губ. 15.2. 1923 павет скасаваны, воласці перададзены ў Аршанскі, Бачэйкаўскі і Віцебскі паветы.

В.Л.Насевіч.

СЕ́ННЕНСКІ РАЁН. Размешчаны на ПдУ Віцебскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Пл. 2 тыс. км^2. Нас. 33,4 тыс. чал. (2001), гарадскога 37,4%. Сярэдняя шчыльн. 17 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Сянно*. Уключае г.п. *Багушэўск*, 334 сельскія населеныя пункты, Багушэўскі пасялковы Савет, 12 сельсаветаў: Аляксіяніцкі, Багданаўскі, Багушэўскі, Беліцкі, Какоўчынскі, Машканскі, Нямойтаўскі, Обальскі, Расненскі, Студзёнкаўскі, Ульянавіцкі, Ходцаўскі.

Тэр. раёна знаходзіцца пераважна ў межах *Чашніцкай раўніны*, на Пд — *Аршанскага ўзвышша*, на крайнім У — *Лучоскай нізіны*. Паверхня ў паўд. ч. ўзгорыста-платопадобная, астатняя раўнінная, з асобнымі ўчасткамі камаў і озаў, 80% яе знаходзіцца на выш. 150—200 м, найвыш. пункт 255 м (на Пд раёна). Карысныя выкапні: торф, пясчана-жвіровы матэрыял, гліна і суглінкі, пяскі. Сярэдняя т-ра студз. -7,5 °С, ліп. 17,8 °С. Ападкаў 592 мм за год. Вегетац. перыяд 185 сут. Найб. рэкі Абалянка, Серакаратнянка (прытокі Лучосы) і Бярозка з Крывінкай. Найб. азёры Сянно, Бярозаўскае, Серакаротня, Кічына, Багданаўскае, Ліпна, Вял. Святое, Сосна, Ходцы. Пераважаюць глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (57,8%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (19,8%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (11,5%). Пад лесам 33% тэр. раёна. Лясы пераважна хваёвыя, бярозавыя, яловыя, шэраальховыя, чорнаальховыя, асінавыя; трапляюцца дубовыя, ясянёвыя, кляновыя. Каля 10% штучныя хваёвыя і яловыя насаджэнні. Адметныя лясныя масівы: Цёмная пушча, Абалянская лясная дача, Канеўская дача, Сенненская пушча, Казённік, Купаваць, Іванькаўская пушча, Бор, Барок. Балоты займаюць 8% тэрыторыі, найб. масівы: Мох-Ніжняя Крывіна, Хабоціна-Бярозка, Капланскі Мох, Замашанскі Мох, Рудзецкае. На тэр. раёна ахоўныя тарфянікі: Зады, Мацькова, Расненскі Мох, Роў, Чысты Мох, Чысцік і Чысцік 1-ы. Помнікі прыроды рэсп. значэння: валуны «Клін» каля в. Арляны, «Пярун» каля в. Расходна, «Чортаў камень» каля в. Забор'е і «Чортаў камень» («Кравец») каля в. Вароніна; дуб і елка «Партызанскія» ў Скрыдлеўскім лясніцтве. Помнікі прыроды мясц. значэння: крыніцы Капліч-ка і Пясчанка ў г. Сянно.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 73,5 тыс. га, з іх асушаных 27,5 тыс. га. На 1.1.2002 у раёне 21 калгас, 3 рэспубліканскія і 5 камунальных с.-г. прадпрыемстваў, 27 фермерскіх гаспадарак. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, ільнаводстве, вырошчванні збожжавых і кармавых культур, бульбы. Прадпрыемствы харч. (спірт, сухое абястлушчанае малако, масла сметанковае), першаснай апрацоўкі лёну (ільновалакно), дрэваапр. (мэбля), каператыўнай (хлеба-булачныя і каўбасныя вырабы, безалкагольныя напіткі) прам-сці, вытв-сць кармавых дабавак (кармавы лізін), лясгас. Па тэр. раёна праходзяць чыгункі Орша — Віцебск, Орша — Лепель; аўтадарогі Віцебск — Орша, Орша — Лепель, Віцебск — Талачын; нафтаправод «Дружба». У раёне 17 сярэдніх, 11 базавых, у т.л. 2 школы-інтэрнаты і школа-садок, 12 пачатковых, у т.л. 2 школы-садкі, 1 спарт., 1 муз. школы, 2 дзіцячыя школы мастацтваў, цэнтры дзіцячай творчасці і пазашкольнай працы, 15 дашкольных устаноў, 29 клубаў і 12 дамоў культуры, Дом рамёстваў, 45 б-к, 7 бальніц, 2 паліклінікі, амбулаторыя, 25 фельч.-ак. пунктаў, дзіцячы санаторый. Краязнаўчы музей. Помнікі архітэктуры: паштовая станцыя (канец 1840-х г.) каля в. Паграбёнка на аўтамагістралі Кіеў — С.-Пецярбург; сядзіба з пейзажным паркам, сажалкай і гасп. зонай (2-я пал. 19 ст.) у в. Старая Беліца, дзе ў 1903—04 жыў і працаваў Я.Купала. Выдаецца газ. «Голас Сенненшчыны».

Р.Р.Паўлавец, С.В.Шайко.



Аўтар В.Л.Насевіч

чак атр. лускакрылых. Каля 200 відаў. Пашыраны на ўзлесках, балотах, лугах. На Беларусі 6 відаў: арканія, або сатыр белапалосы (C. arcania), C. звычайная,

Сенніцы: 1 — Гера; 2 — Эдып.

СЕ́ННІЦЫ (Coenonympha), род матылёў сям. аксамітніц, або сатыраў, ці во-

або памфіл (C. pamphilus), іфіда (C. iphis, або glycerion), С. тулія (C. tullia), С. Гера (C. hero) і С.Эдып (C. oedippus); С.Гера і С. Эдып занесены ў Чырв. кнігу.

Размах крылаў 24—40 мм. Асн. тон афарбоўкі буры, карычневы. Спод крылаў з метал. бліскучай палоскай уздоўж краю. Вусікі з плаўна патоўшчанай булавой. Пярэднія ногі недаразвітыя. За год 1(3) пакаленне. Вусені кормяцца ў асн. дзікарослымі злакамі і асокамі. Зімуюць вусені. *С.Л.Максімава.*

СЕН-П'ЕР (Saint-Pierre), горад, адм. ц. франц. ўладання Сен-П'ер і Мікелон, на ўсх. беразе в-ва Сен-П'ер. Каля 6 тыс. ж. (2001). Марскі порт. Аэрапорт. Цэнтр рыбалоўства і рыбаперапр. прам-сці.

СЕН-П'ЕР І МІКЕЛО́Н (Saint-Pierre et Miquelon), уладанне Францыі ў Атлантычным ак., на Пд ад в-ва Ньюфаўндленд. Складаецца з 8 астравоў, найб. з якіх Мікелон (пл. 216 км²) і Сен-П'ер (пл. 25 км²). Агульная пл. 242 км². Нас. 6,9 тыс. чал. (2000), нашчадкі франц. пасяленцаў з Нармандыі і Брэтані. Афіц. мова французская. Вернікі пераважна католікі. Адм., асноўны эканам. цэнтр і порт — г. *Сен-П'ер.* Астравы раўнінныя і ўзгорыстыя, выш. да 240 м (г. Гранд-Мантань на в-ве Мікелон). Клімат умераны марскі, вільготны. Сярэдняя т-ра ліп. 14°С, лютага -3°С. За год выпадае больш за 1400 мм ападкаў. У раслінным покрыве пераважаюць таежныя лясы з елкі, забалочаныя лугі, тарфяныя сфагнавыя балоты. Аснова гаспадаркі — рыбалоўства і перапрацоўка рыбы. Валавы ўнутр. прадукт 74 млн. дол., каля 11 тыс. дол. на 1 чал. (1996). Прыбярэжная лоўля рыбы. У г. Сен-П'ер халадзільнікі і прадпрыемствы па перапрацоўцы рыбы (сушка, саленне, вэнджанне, вытв-сць кансерваў, рыбнай мукі і тлушчу); прадпрыемствы па рамонце рыбалавецкіх суднаў і рыштунку, абслугоўванне рыбалавецкіх суднаў і інш. Ёсць асобныя лесанарыхтоўчыя і дрэваапр. прадпрыемствы. Мясц. значэнне мае харч. (хлебапякарная, безалкагольных напіткаў) і лёгкая прам-сць. Вытв-сць электраэнергіі 39 млн. кВт·гадз (1996). На некалькіх звераводчых фермах вырошчваюць серабрыстых лісоў і норак. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 3 тыс. га зямлі. Пераважае жывёлагадоўля, гадуюць буйн. раг. жывёлу, авечак, свіней. Птушкагадоўля. Земляробства абмежавана неспрыяльнымі прыроднымі ўмовамі. Найб. развіта вырошчванне агародніны і бульбы. Транспарт марскі, аўтамаб., авіяцыйны. Усе знешнегандл. сувязі адбываюцца праз порт Сен-П'ер, на астравах 114 км аўтадарог, у т.л. 69 км з цвёрдым пакрыццём; 2 аэрадромы, у т.л. міжнар. на в-ве Сен-П'ер (паветраная сувязь пераважна з Канадай). Замежны турызм (пераважна з Канады, ЗША, Францыі). Экспарт — рыба, рыбапрадукты і пушніна; імпарт — харч. і прамысл. тавары, паліва і інш. Уладанне атрымлівае эканам. дапамогу Францыі. Грашовая адзінка — франц. франк.



У пач. 16 ст. С.-П. і М. наведвалі нарманскія, гасконскія і брэтонскія рыбакі. У 1536 франц. мараплавец Ж.*Карцье* абвясціў астравы ўладаннем Францыі. Уваходзіла ў склад франц. калоніі Квебек. Пасля страты Квебека ў сярэдзіне 18 ст. — адзінае франц. ўладанне ў Паўн. Амерыцы; канчаткова замацаваны за Францыяй у 1816. З 1946 заморская тэрыторыя Францыі, з 1976 — заморскі дэпартамент, з 1985 — тэр. адзінка Францыі.

СЕНПО́ЛІЯ, узумбарская фіялка (Saintpaulia), род кветкавых раслін сям. геснерыевых. Больш за 20 відаў. Пашыраны ў горных трапічных лясах Усх. Афрыкі. У Еўропе ўведзены ў культуру ў 19 ст. Існуе некалькі тысяч сартоў і гібрыдаў. На Беларусі вырошчваюць як пакаёвую расліну. Найб. папулярныя — мініяцюрныя і ампельныя формы з махровымі кветкамі.

Сарты сенполіі.

СЕН-САНС 331

Шматгадовыя травяністыя расліны выш. да 30 см. Сцёблы ўкарочаныя, часам сцелістыя. Апушанае лісце чаранковае, акруглае, гафрыраванае або хвалістае па краях. Кветкі адзіночныя ці ў рыхлых гронках, ад белага, ружовага, блакітнага да цёмна-сіняга і пурпуровага колераў; простыя, махрыстыя, паўмахровыя, махровыя, зоркападобныя, гафрыраваныя. Плод — каробачка. Дэкар. расліны.

Літ.: Михеев В.А. Сенполии. М., 1993.

СЕН-САНС (Saint-Saëns) Шарль Каміль (9.10.1835, Парыж — 16.12.1921), французскі кампазітар, піяніст, дырыжор, муз. крытык, педагог. Чл. Ін-та Францыі (1881), ганаровы д-р Кембрыджскага ун-та (1893), ганаровы чл. Пецярб. аддз. Рус. муз. т-ва (1909). З 1848 вучыўся ў Парыжскай кансерваторыі ў Ф.Бенуа (арган), Ф.Галеві (кампазіцыя).

У 1853—77 арганіст у саборах Парыжа, адначасова выкладаў у нідэрмееравскай Школе духоўнай музыкі. Канцэртаваў (у асн. са сваімі творамі) як піяніст, арганіст і дырыжор у многіх краінах, у т.л. ў Расіі (1875, 1887). Аддаваў перавагу сімф. і камерна-ансамблевай музыцы, якая вызначалася гарманічнасцю, арганізаванасцю і інтэлектуальнасцю, а аркестроўка — яснасцю і празрыстасцю каларыту. Развіваў традыцыі рамант. праграмнага сімфанізму Ф.Ліста і Г.Берліёза, імкнуўся да выяўленчасці, тэатральнасці і праграмнасці. Аўтар 12 опер, у т.л. «Самсон і Даліла» (паст. 1877), «Генрых VIII» (1883), «Асканіо» (1890); балета «Жавота» (1896); 3 араторый, 4 кантат, «Урачыстай месы» (1856), Рэквіем (1878); 3 сімфоній

(1852, 1859, 1886 з арганам), сімф. паэм, у т.л. «Танец смерці» (1874); фантазіі для арк. «Карнавал жывёл» (1886, у ёй п'еса «Лебедзь») і інш. Яго эстэт. погляды адлюстраваны ў зб-ках «Гармонія і мелодыя» (1885), «Партрэты і ўспаміны» (1899) і інш. Сярод вучняў — Г.*Фарэ*, А.Месажэ.

Літ.: Кремлев Ю. Каміль Сен-Санс. М., 1970. *І.Ю.В'югінава.*

СЕ́НСАРНЫ ПЕРАКЛЮЧА́ЛЬНІК, бескантактны *пераключальнік*, які спрацоўвае пры датыканні аператара да спец. адчувальнай (сенсарнай; ад лац. sensus адчуванне) пляцоўкі. Вырабляецца на аснове паўправадніковых, оптаэлектронных і інш. прылад.

Найб. просты С.п. электраметрычнага тыпу, прынцып дзеяння якога грунтуецца на здольнасці скуры чалавека праводзіць эл. ток. Сенсарная пляцоўка пераключальніка мае 2 ізаляваныя адна ад адной палавінкі; пасля датыкання аператарам да гэтай пляцоўкі ланцуг замыкаецца і атрыманы эл. сігнал пасля ўзмацнення перадаецца на блок пераключэння. Выкарыстоўваецца ў прыладах уводу інфармацыі, радыёэлектроннай і інш. апаратуры.

СЕНСА́ЦЫЯ (франц. sensation ад лац. sensus пачуццё, адчуванне), падзея, паведамленне, якія выклікаюць моцнае ўражанне.

СЕНСІБІЛІЗА́ТАР у фатаграфіі, рэчыва, уведзенае ў *фатаграфічную эмульсію* для яе *сенсібілізацыі*. Пры гэтым фотаматэрыялы набываюць дадатковую адчувальнасць да той вобласці аптычнага спектра, дзе паглынае сам С.

Галагенасярэбраныя *фатаграфічныя матэрыялы* маюць натуральную адчувальнасць да сіне-фіялетавай вобласці аптычнага выпрамянення. З дапамогай С. ім надаюць адчувальнасць да доўгахвалевых абласцей (зялёнай, чырвонай і інфрачырвонай) ці павышаюць іх адчувальнасць у сіне-фіялетавай вобласці. Для сенсібілізацыі фотаслаёў у шырокай вобласці спектра выкарыстоўваюцца сумесі розных С.

СЕНСІБІЛІЗА́ЦЫЯ (франц. sensibilisation ад лац. sensibilis адчувальны) у медыцыне, набыццё арганізмам спецыфічнай павышанай адчувальнасці да *алергенаў*. Ляжыць у аснове шэрагу алергічных захворванняў. Адрозніваюць актыўную С. (увядзенне або пападанне алергенаў у арганізм) і пасіўную (увядзенне ў здаровы арганізм сывараткі крыві або лімфацытаў ад актыўна сенсібілізаванага донара). С. могуць выклікаць адзін або некалькі алергенаў.

І.М.Семяненя.

СЕНСІБІЛІЗА́ЦЫЯ фатаграфічная, увядзенне ў *фатаграфічную эмульсію* спец. дамешак (*сенсібілізатараў*) для павелічэння агульнай *святлоадчувальнасці* і пашырэння вобласці спектральнай адчувальнасці фотаматэрыялу. Бывае аптычная і хімічная.

Аптычная С. ажыццяўляецца дамешаннем у фотаэмульсію рэчыва, здольнага перадаць галагенідам серабра паглынутую энергію святла (непасрэдна не ўдзельнічае ў фотахім. рэакцыі). Павышае святлоадчувальнасць матэрыялаў у вобласці паглынання сенсібілізатара. Хімічная С. грунтуецца на адсарбцыйных працэсах у месцах парушэння крышталічнай рашоткі галагеніду серабра і хім. узаемадзеянняў святлоадчувальнага рэчыва з уведзенымі дамешкамі. Павышае агульную святлоадчувальнасць фатагр. эмульсій без пашырэння вобласці спектральнай адчувальнасці.

СЕНСІ́ЛЫ, сэнсілы (ад лац. sensilis які адчувае), прасцейшыя органы пачуццяў у беспазваночных жывёл. Складаюцца з кутыкулярнага аддзела і 1 або некалькіх чуллівых нерв. клетак, ад якіх адыходзяць нерв. валокны ў ц.н.с. Выконваюць функцыі гігра-, механа-, тэрма-, хема-, экстэра- і інтэрарэцэптараў. Размешчаны па целе паасобку або сабраныя ў групы, найб. іх колькасць на вусіках, ротавых ч., хваставых прыдатках і канечнасцях, дзе яны аб'яднаны ў складаныя органы па некалькі тысяч С. (напр., на антэнах трутня меданоснай пчалы каля 30 тыс.).

СЕН-СІМО́Н (Saint-Simon) Клод Анры дэ Руўруа (de Rouvroy; 17.10.1760, Парыж — 19.5.1825), французскі мысліцель, сацыёлаг, адзін з заснавальнікаў *утапічнага сацыялізму*. Са стараж. роду франц. арыстакратаў. Вучань Ж.Л.*Д'Аламбера*. Удзельнік вайны за незалежнасць у Паўн. Амерыцы 1775—83. У гады франц. рэвалюцыі 1789—94 далучыўся да якабінцаў, але потым адышоў ад іх. З 1797 займаўся навук. дзейнасцю. Асн. творы: «Пісьмы жэнеўскага жыхара да сучаснікаў» (1803), «Аб прамысловай сістэме» (1821), «Катэхізіс прамыслоўцаў» (1823—24), «Новае хрысціянства» (1832), «Нарыс навукі пра чалавека», «Праца пра сусветнае прыцяжэнне» (абодва 1859). Паводле С.-С., грамадства ў сваім развіцці праходзіць шэраг ступеняў — ад першабытнай праз рабства да феад.-саслоўнага ладу. Рухаючай сілай яго выступаюць ідэі (рэліг., метафіз., навук.) і «індустрыя» (эканам. дзейнасць людзей). Кожная ступень грамадства характарызуецца стваральнай («арганічнай») і разбуральнай («крытычнай») стадыямі. На «крытычнай» стадыі феад.-саслоўная сістэма замяняецца новай, т.зв. «прамысловай сістэмай», якая грунтуецца на навук. ведах, планаванні гаспадаркі, размеркаванні па здольнасцях, абавязковай для ўсіх грамадзян працы і г.д. У якасці базавых прынцыпаў функцыянавання ідэальнага грамадства С.-С. прапанаваў навук. арг-цыю працы, адмену права на спадчыну, грамадскую лесвіцу, як строгую «іерархію здольнасцей». Лічыў, што ў выніку радыкальных пераўтварэнняў у паліт. і эканам. сферах мірным шляхам будуць створаны неабходныя ўмовы для развіцця індывід. здольнасцей кожнага чалавека ў адпаведнасці з яго прыродай, будзе выключана магчымасць эксплуатацыі чалавека чалавекам, сфарміруецца адзіны клас — «індустрыялаў»; важную ролю ў пераадольванні сац. супярэчнасцей, кансалідацыі розных сац. слаёў будзе адыгрываць новая рэлігія — «новае хрысціянства».

Тв.: Рус. пер. — Избр. соч. М.; Пг., 1923; Избр. соч. Т. 1—2. М.; Л., 1948.

Літ.: Плеханов Г.В. Французский утопический социализм XIX в. // Избр. филос. произв. М., 1957. Т. 3; Волгин В.П. Сен-Симон и сен-симонизм. М., 1961; Кучеренко Г.С. Сен-симонизм в общественной мысли XIX в. М., 1975. *Т.І.Адула.*

А.Сен-Сімон.

СЕН-СІР, Гуўён-Сен-Сір (Gouvion-Saint-Cyr) Ларан (17.7.1764, г. Туль, Францыя — 17.3.1830), французскі ваенны і дзярж. дзеяч, маршал Францыі (1812). З 1792 у рэсп. арміі, ген. (1794). Удзельнік войнаў супраць 1-й (1793—97), 2-й (1798—1801) і 3-й (1805) антыфранц. кааліцый, вайны ў Іспаніі (1808—09). У *вайну 1812* камандаваў 6-м (баварскім) корпусам. Пасля Віленскай аперацыі 1812 яго корпус разам з 2-м увайшоў у асобную вайск. групу пад камандаваннем Н.Ш.*Удзіно*. У час *Полацкіх бітваў 1812* паранены С.-С. замяніў цяжкапараненага Удзіно, атрымаў перамогу і прымусіў рускіх адступіць. 18—20 кастр. ён зноў паранены, перадаў камандаванне 2-м і 6-м карпусамі ген. К.Ж.Леграну. З-за нязгоды ген. Врэдэ (камандуючы 6-м корпусам) падпарадкавацца Леграну 24 кастр. баварскае войска было разбіта каля в. Бабынічы. С.-С. зноў прыняў камандаванне і злучыўся 30 кастр. з 9-м корпусам маршала К.Віктора ў раёне Чашнікаў, здаў яму камандаванне і пакінуў армію. У перыяд рэстаўрацыі каралеўскай улады на каралеўскай службе, ваенны (1815 і 1817—19) і марскі (1817) міністр. Аўтар успамінаў (т. 1—4, 1831). *В.В.Антонаў.*

СЕНСІТАМЕ́ТРЫЯ (ад позналац. sensitivus адчувальны + *...метрыя*), сукупнасць метадаў вымярэнняў фатагр. уласцівасцей святлоадчувальных матэрыялаў; раздзел *метралогіі*. Узнікла ў 1840-я г. (з адкрыццём *фатаграфіі*).

Падзяляецца на *дэнсітаметрыю* (вымярэнне аптычных шчыльнасцей праяўленых фотаслаёў), інтэгральную С. (вымярэнне ўласцівасцей святлоадчувальных матэрыялаў пры ўздзеянні на іх выпрамяненняў складанага спектральнага саставу) і спектральную С. (вымярэнне ўласцівасцей пры ўздзеянні монахраматычнага святла). Да сродкаў С. адносяць *дэнсітометры, мікрафатометры, сенсітометры* і інш. Метадамі С. карыстаюцца ў тых галінах навукі і тэхнікі, дзе праводзіцца фатагр. рэгістрацыя выпрамянення (спектраскапіі, астраноміі, ядз. фізіцы, аэрафатаграфіі і інш.).

СЕНСІТО́МЕТР, прылада, з дапамогай якой на даследаваных *фатаграфічных*

матэрыялах пасля праяўлення атрымліваюць шэраг пачарненняў і каляровых пашырненняў (сенсітаграму); сродак *сенсітаметры*. Для атрымання сенсітаграмы фотаматэрыял паслядоўна экспануюць (гл. *Экспазіцыя*) дазіраваным святлом зададзенага спектральнага саставу. Крыніца святла — лямпа напальвання; спектральны састаў святла мяняюць з дапамогай святлафільтраў, асветленасць дазіруюць фотаметрычным клінам.

СЕНСО́РНАЕ ВЫХАВА́ННЕ, мэтанакіраванае развіццё і ўдасканаленне сенсорных працэсаў (*адчуванняў, успрымання, уяўленняў*). Садзейнічае ўсебаковаму развіццю асобы, пачуццёваму *пазнанню*; з'яўляецца асновай для *разумовага выхавання, фізічнага выхавання, эстэтычнага выхавання*. Уключае фарміраванне ўспрымання формы, памеру, прасторавых адносін паміж прадметамі, колеру, развіццё гукавога аналізу мовы, муз. слыху, рухальных адчуванняў і інш. У працэсе С.в. падрыхтоўваецца пераход ад пачуццёвага да рацыянальнага пазнання, ад успрымання да мыслення, фарміруецца аснова для практычнай і інтэлектуальнай дзейнасці. У сувязі з тым, што сенсорныя працэсы найб. інтэнсіўна развіваюцца ў дашкольным дзяцінстве, С.в. — адна з цэнтр. праблем *дашкольнай педагогікі* (Я.А.Каменскі, І.Г.Песталоці, Ф.Фрэбель, М.Мантэсоры і інш.). У раннім і дашкольным дзяцінстве развіццё сенсорных працэсаў цесна звязана з практычнай дзейнасцю, таму найважнейшую ролю ў С.в. адыгрываюць гульні, заняткі маляваннем, лепкай, музыкай, канструяваннем, а таксама славеснае абазначэнне якасцей прадметаў. Развіццё агульных інтэлектуальных здольнасцей чалавека ў значнай ступені абумоўлена асаблівасцямі яго С.в. ў дзяцінстве.

СЕНСО́РНЫЯ СІСТЭ́МЫ, аналізатары, сукупнасць перыферычных і цэнтральных нерв. утварэнняў, якія ўспрымаюць і аналізуюць інфармацыю аб уздзеянні на арганізм раздражняльнікаў. Перыферычныя аддзелы С.с. — *рэцэптары* — размешчаны на паверхні цела (у скуры, слізістых абалонках), у глыбіні (напр., механарэцэптары сардэчна-сасудзістай сістэмы), уваходзяць у склад сенсорных органаў (напр., вока, вуха). Сігналы ад рэцэптараў па сенсорных (аферэнтных) нервах паступаюць у ц.н.с., дзе інфармацыя перапрацоўваецца. Участкі кары вял. паўшар'яў, куды пераважна паступаюць аферэнтныя імпульсы, з'яўляюцца праекцыяй рэцэптарных палёў у кары і ўяўляюць коркавыя аддзелы С.с. (напр., зрокавая зона знаходзіцца пераважна ў патылічнай вобласці кары, слыхавыя — у скроневай). У выніку ўзгодненай работы розных С.с. у вял. паўшар'ях фарміруецца праграма паводзін і ацэнка выкананага дзеяння.

Літ.: Судаков К.В. Общая теория функциональных систем. М., 1984; Крылова А.Л. Физиология сенсорных систем. М., 1986.

С.С.Ермакова.

СЕНСУАЛІ́ЗМ (франц. sensualisme ад лац. sensus успрыняцце, пачуццё, адчуванне), кірунак у *тэорыі пазнання*, які прызнае *адчуванне* адзінай крыніцай аб'ектыўных *ведаў*. Змест *пазнання* і *свядомасці* імкнецца вывесці з дзейнасці органаў пачуццяў і іх сведчанняў. Элементы С. прысутнічаюць у філасофіі Стараж. Індыі (вучэнне чарвака), Стараж. Кітая (маізм), Стараж. Грэцыі (Геракліт, часткова Дэмакрыт і Арыстоцель). У гісторыі філасофіі сфарміраваліся 2 процілеглыя плыні С.: ідэаліст. і матэрыялістычная. Ідэалістычны С. разглядае пачуццёвую дзейнасць чалавека як самаст. і самадастатковую сферу свядомасці. Яго вытокі ў вучэнні Пратагора, які абвяшчаў пачуццёвае *ўспрыманне* адзінай крыніцай ведаў аб уласным стане чалавека; пазнанне знешніх прычын гэтых станаў ён лічыў немагчымым. Матэрыялістычны С. разглядае пачуццёвую дзейнасць чалавека як сувязь яго свядомасці са знешнім светам, а сведчанні органаў пачуццяў — адлюстраваннем навакольнага асяроддзя. Асновы паслядоўнага матэрыяліст. С. сфармуляваны Эпікурам. Асноўны прынцып С. стоікаў — «няма нічога ў розуме, чаго б раней не было ў пачуццях». Прадстаўнікі матэрыяліст. С. 17 ст. — П.Гасендзі, Т.Гобс, Дж.*Лок*, ідэаліст. С.— Дж. *Берклі*. Сенсуалісты матэрыяліст. кірунку 18 ст. сцвярджалі, што крыніцай ведаў служаць адчуванні, якія праджаюцца шляхам уздзеяння матэрыяльных прадметаў на органы пачуццяў чалавека (франц. матэрыялісты Ж.Ламетры, К.Гельвецый, Д.Дзідро, П.Гольбах). Ням. філосаф Л.Феербах лічыў, што адчуванні маюць суб'ектыўны характар, але іх аснова аб'ектыўная, заключана ў матэрыяльным свеце. Сучасныя тэорыі пазнання спалучаюць С. і *рацыяналізм* і аналізуюць іх узаемасувязь. *І.В.Катляроў.*

СЕНТ-ВІ́НСЕНТ І ГРЭНАДЗІ́НЫ (Saint Vincent and the Grenadines), дзяржава ў Вест-Індыі, на в-ве Сент-Вінсент і паўн. ч. а-воў Грэнадзіны ў групе *Малых Антыльскіх астравоў*. Пл. 389 км². Нас. 115,5 тыс. чал. (2000). Афіц. мова — англійская, пашыраны яе мясц. дыялект. Сталіца — г. *Кінгстаўн*. У адм. адносінах падзелена на 6 акруг. Нац. свята — Дзень незалежнасці (27 кастр.).

Дзяржаўны лад. Канстытуцыйная манархія. Чл. Садружнасці. Дзейнічае канстытуцыя 1979. Кіраўнік дзяржавы — брыт. манарх, якога прадстаўляе ген.-губернатар. Орган заканад. улады — аднапалатная Палата сходу з 15 дэпутатаў (выбіраюцца насельніцтвам на 5 гадоў) і 6 сенатараў, прызначаных ген.-губернатарам. Выканаўчая ўлада — урад на чале з прэм'ер-міністрам (кіраўнік парламенцкай большасці).

Прырода. А-вы Сент-Вінсент (пл. 344 км²) і Грэнадзіны (32 дробныя а-вы) вулканічнага паходжання. На в-ве Сент-Вінсент ланцуг старых вулканаў, найвышэйшы пункт — дзеючы вулкан Суфрыер (1234 м). Клімат трапічны, пасатны. Сярэдняя т-ра 26 °С, гадавая колькасць ападкаў ад 1500 мм на Пд і З да 3700 мм на ўсх. схілах гор. Сухі сезон у снеж.—маі. Частыя ўраганы. Пад лесам і хмызнякамі 36% тэрыторыі. Жывёльны свет прадстаўлены пераважна птушкамі. Мора багатае рыбай, малюскамі, ракападобнымі. Ёсць некалькі заказнікаў.

Герб і сцяг **Сент-Вінсента і Грэнадзінаў**.

Насельніцтва. Асн. народ сентвінсентцы. Аснову этнасу складаюць нашчадкі неграў-рабоў, якія часткова змяшаліся з французамі і англічанамі; называюць сябе крэоламі. Жывуць таксама выхадцы з Вялікабрытаніі, невял. групы парт-



тугальцаў, індыйцаў і чорных карыбаў. Вернікі — англікане і метадысты, ёсць адвентысты, баптысты, католікі і інш. Сярэднегадавы прырост 0,57% (1999). Сярэдняя шчыльн. 296 чал. на 1 км². У гарадах жыве 54% насельніцтва. У сельскай гаспадарцы занята 26% насельніцтва, у прам-сці — 17%, у абслуговых галінах — 57%.

Гісторыя. Першапачатковыя насельнікі астравоў — індзейцы, аравакі і карыбы. В-аў Сент-Вінсент адкрыты Х.*Калумбам* у 1498. У 17—18 ст. за валоданне астравамі змагаліся Францыя і Вялікабрытанія, замацаваны за апошняй у 1783. Большая ч. індзейскага насельніцтва знішчана, рэшткі яго змяшаліся з неграмі-рабамі, якіх прывозілі для працы на плантацыях. У 1958—62 у складзе Вест-Індскай Федэрацыі, з 1969 «асацыіраваная з Вялікабрытаніяй дзяржава». 27.10.1979 абвешчана незалежнай дзяржавай у складзе Садружнасці. Дзейнічаюць паліт. партыі: Новая дэмакр. партыя, Аб'яднаная лейбарысцкая партыя. С.-В. і Г. — чл. ААН (з 1980).

Гаспадарка. Аснова эканомікі — сельская гаспадарка і абслугоўванне турыстаў. У структуры валавога ўнутр. прадукту (289 млн. дол., 2,4 тыс. долараў на 1 чал., 1998) сельская гаспадарка складае 10,6%, гандаль і паслугі (укл. турызм) — 71,9%, прам-сць — 17,5%. Цёплы клімат, пясчаныя пляжы, празрыстыя воды, каралавыя рыфы штогод прыцягваюць каля 120 тыс. турыстаў (пераважна з ЗША, Канады і Зах. Еўропы). У 1999 даход ад турызму склаў 77 млн. долараў. Пад ворывам і шматгадовымі насаджэннямі каля 3,9 тыс. га. Асн. экспартныя культуры: бананы (збор каля 80 тыс. т штогод), какосавыя арэхі (20 тыс. т), манга, мускатны арэх, арарут (крухмалазмяшчальны караняплод). Вырошчваюць батат, маніёк, ямс, цукр. трыснёг, тытунь, агародніну, каву, какаву. Гадуюць птушак (200 тыс. галоў, 1997), буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак. Рыбалоўства і марскія промыслы. Прам-сць спецыялізуецца на перапрацоўцы с.-г. сыравіны. Прадпрыемствы па вытв-сці крухмальнай мукі з араруту (150 т штогод), адзення, мэблі, цэменту, рому, піва, тытуню, спарт. інвентару, перапрацоўцы копры, зборцы электраапаратуры. Вытв-сць электраэнергіі 64 млн. кВт·гадз (1998). Даўж. аўтадарог 1040 км, у т.л. з цвёрдым пакрыццём 320 км. На астравах 5 тыс. пасаж. і 3,2 тыс. грузавых аўтамабіляў. Пад флагам дзяржавы з прычыны льготных падаткаў плаваюць 814 суднаў (агульная грузападымальнасць 7,7 млн. рэгістравых т) з 20 краін. 6 аэрапортаў (гал. — Эрнас-Вейя каля Кінгстаўна). У 1997 экспарт склаў 47,3 млн. дол., імпарт — 158 млн. дол. Экспартуюць бананы (37%), муку з араруту, копру, агародніну, тытунь і інш.; імпартуюць харч. прадукты, машыны і абсталяванне, паліва. Гал. гандл. партнёры: краіны Карыбскага бас. (49% экспарту і 28% імпарту), ЗША (10% і 36%), Вялікабрытанія (16% і 13%). Краіна атрымлівае дапамогу ад Вялікабрытаніі (47,5 млн. дол. 1995). Грашовая адзінка — усх.-карыбскі долар.

Л.В.Лоўчая (прырода, насельніцтва, гаспадарка).

СЕНТ-ГО́ДЭНС (Saint-Gaudens) Агастэс (1.3.1848, г. Дублін, Ірландыя — 3.8.1907), амерыканскі скульптар; адзін са стваральнікаў нац. школы скульптуры 19 ст. Вучыўся ў Нац. акадэміі малюнка ў Нью-Йорку (1864—66), у Школе прыгожых мастацтваў у Парыжы (1867—70). У 1870—75 працаваў у Рыме. У творчасці спалучаў імкненне да канкрэтнасці і строгай стрыманасці выявы з паэтычнасцю і вобразнай яркасцю характарыстыкі, смелай жывапіснай лепкай формы: помнікі адміралу Д.Фарагуту ў Нью-Йорку (1881), А.Лінкальну ў Чыкага (1887), надмагіллі сям'і Адамс на могілках Рок-Крык ў Вашынгтоне (1891), мемарыял Р. Шоу ў Бостане (1897), барэльефны партрэт Р.Л.Стывенсана (1899—1900) і інш.

СЕНТ-ДЖОН (Saint John), рака ў ЗША і Канадзе. Даўж. 724 км, пл. бас. 55,4 тыс. км². Пачынаецца ў Белых гарах (сістэма Апалачаў), упадае ў зал. Фанды Атлантычнага акіяна. У вусці ўтварае вадаспад выш. 5 м (са зваротным цячэннем вады ў час высокіх прыліваў). Разводдзе ў крас.—маі. Сярэдні расход вады 1130 м³/с. Сплаўная. Суднаходная ад г. Фрэдэрыктан. У вусці порт Сент-Джон (Канада).

СЕНТ-ДЖОНС (Saint John's), горад, сталіца і гал. эканам. цэнтр дзяржавы Антыгуа і Барбуда, на зах. беразе в-ва Антыгуа. Каля 40 тыс. ж. (2001). Гал. порт. краіны, вузел аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Нафтаперапр. з-д. Прадпрыемствы па вытв-сці цукру і рому, ачыстцы бавоўны. Цэнтр турызму.

СЕНТ-ДЖОНС (Saint John's), горад на У Канады, на паўд.-ўсх. беразе в-ва Ньюфаўндленд. Адм. ц. і гал. эканам. цэнтр прав. Ньюфаўндленд. Каля 100 тыс. ж., з прыгарадамі каля 170 тыс. ж. (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог, порт і рыбалоўная база на Атлантычным акіяне. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць.: рыбаперапрацоўчая, чорная металургія, нафтаперапр., вытв-сць рыбалоўнага рыштунку. Ун-т.

СЕНТ-ДЖО́РДЖЭС (Saint George's), горад, сталіца дзяржавы Грэнада, на зах. беразе в-ва Грэнада. Засн. ў 1650. Каля 40 тыс. ж. з прыгарадамі (2001). Порт на ўзбярэжжы Карыбскага м. (вываз какавы, мускатнага арэха, бананаў), вузел аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Харчасмакавая прам-сць. Бат. сад. Кліматычны курорт.

СЕНТ-ДЗЬЁРДЗЫ (Szent-Györgyi) Альберт (16.9.1893, Будапешт — 22.10.1986), амерыканскі біяхімік. Чл. Нац. АН ЗША (1956) і Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1957). Замежны чл. АН СССР (1947). Ганаровы чл. Венгерскай АН (1945). Скончыў Будапешцкі ун-т (д-р медыцыны, 1917). З 1922 у Нідэрландах, Вялікабрытаніі (д-р філасофіі Кембрыджскага, 1927), ЗША. З 1930 у Венгрыі: з 1931 праф. Сегедскага, з 1945 — Будапешцкага ун-таў. З 1947 у марской біял. лабараторыі і Ін-це па вывучэнні мышцаў у г. Вудс-Хол (ЗША). Навук. працы па працэсах біял. акіслення, хіміі вітамінаў, механізмах мышачнага скарачэння. Вылучыў з жывёльных і расл. тканак аскарбінавую к-ту, адкрыў антыгемарагічны фактар — вітамін Р, устанавіў прыналежнасць рыбафлавіну да комплексу вітаміну B_2. Выявіў у скарачальным мышачным бялку (актаміязіне) 2 звязаныя паміж сабой часткі — актын і міязін, механізм ініцыяцыі адэназінтрыфасфатам працэсу скарачэння мышцаў, каталітычныя функцыі дыкарбонавых к-т у працэсах тканкавага дыхання. Стварыў шэраг тэорый мышачнага скарачэння. Нобелеўская прэмія 1937.

А.Сент-Дзьёрдзы.

А.Ю.Маніна.

СЕНТ-КА́ТАРЫНС (Saint Catharines), горад на ПнУ Канады, на канале Уэленд, у прав. Антарыо. Засн. ў 1790. Каля 350 тыс. ж. з г. Ніягара-Фолс і агульнымі прыгарадамі (2001). Трансп. вузел. Аэрапорт. Прам-сць: разнастайнае машынабудаванне (вузлы аўтамабіляў, электраапаратура, інструменты і інш.), дрэваапр. і цэлюлозна-папяровая, харчовая. Ун-т. Бальнеалаг. курорт.

СЕНТ-КІ́ЛДА (Saint Kilda), біясферны рэзерват у Вялікабрытаніі, на аднайм. астравах, за 70 км на З ад Гебрыдскіх астравоў. Адзін са старэйшых у свеце (першыя ахоўныя меры ўведзены вікінгамі каля 1000 гадоў назад). Пл. 852 га. Архіпелаг утвораны са стромкіх скал (выш. да 430 м), як вынік разбурэння вулкана. Флора складаецца з беднай скальнай расліннасці. Найбольшыя ў Паўн. Атлантыцы калоніі марскіх птушак (глупышоў, олушаў, тупікаў, качурак і інш.). У выніку геагр. ізаляцыі ўзнік шэраг унікальных эндэмічных форм і відаў жывёл. У 1986 С.-К. ўключаны ЮНЕСКА ў спіс Сусветнай спадчыны.

В.П.Кісель.

СЕНТ-КІТС І НЕ́ВІС (Saint Kitts and Nevis), Федэрацыя Сент-Кітс і Невіс (Federation of Saint Kitts and Nevis), дзяржава ў Вест-Індыі, у групе *Малых Антыльскіх астравоў* ва ўсх. ч. Карыбскага м. Пл. 261,6 км². Нас. 38,8 тыс. чал. (2000). Афіц. мова — англійская, пашыраны яе мясц. дыялект. Сталіца — г. *Бастэр* (на в-ве

Сент-Кітс). У адм. адносінах падзелена на 14 акруг. Нац. свята — Дзень незалежнасці (19 верасня).

Дзяржаўны лад. Канстытуцыйная манархія. Чл. Садружнасці. Дзейнічае канстытуцыя 1983. Кіраўнік дзяржавы — брыт. манарх, якога прадстаўляе ген.-губернатар. Вышэйшы заканад. орган — аднапалатны Нац. сход з 3 сенатараў (прызначаюцца ген.-губернатарам) і 11 дэпутатаў (выбіраюцца насельніцтвам на 5 гадоў). Выканаўчую ўладу ажыццяўляе ўрад на чале з прэм'ер-міністрам (кіраўнік парламенцкай большасці). Жыхары в-ва Невіс маюць уласныя заканад. і выканаўчыя органы. Губернатара прадстаўляе прызначаны ім намеснік.

Прырода. А-вы Сент-Кітс (168,4 км^2) і Невіс (93,2 км^2) вулканічнага паходжання, гарыстыя (выш. да 1156 м на в-ве Сент-Кітс). Клімат трапічны, пасатны, гарачы. Сярэднія месячныя т-ры 18—24°С, ападкаў ад 700 да 1200 мм за год. Горныя схілы ўкрыты трапічнымі лясамі. Пад лесам і хмызнякамі 17% тэрыторыі.

Насельніцтва. Асн. народ сенткітсцы, пераважна негры (86%) і мулаты. Вернікі — пратэстанты (англікане і метадысты) і католікі. Сярэднегадавы прырост насельніцтва 1,34% (1999). Сярэдняя шчыльн. 148 чал. на 1 км^2. Гар. насельніцтва 34%. У сельскай гаспадарцы і прам-сці занята 31% працоўных, у абслуговых галінах 69%. Значная эміграцыя, пераважна ў Вялікабрытанію.

Гісторыя. Стараж. насельніцтва — індзейцы аравакі і карыбы, большасць якіх знішчана еўрап. каланізатарамі. В-аў Сент-Кітс адкрыты Х.*Калумбам* у 1493. У 1623 тут заснавалі сваё пасяленне англічане, у 1624 — французы. Доўгі час за валоданне астравамі ішла барацьба паміж Францыяй і Вялікабрытаніяй; канчаткова замацаваны за апошняй у 1783. У 1871—1956 ч. брыт. калоніі Падветраныя а-вы, у 1958—62 — Вест-Індскай федэрацыі. З 1967 «асацыіраваная з Вялікабрытаніяй дзяржава» (разам з в-вам Ангілья, выйшла ў 1980). 19.9.1983 абвешчана незалежнасць С.-К. і Н. ў складзе Садружнасці. Гал. праблемай дзяржавы з'яўляюцца сепаратысцкія настроі на в-ве Невіс, дзейнічаюць паліт. партыі: Лейбарысцкая, Рух нар. дзеяння, Рэфармісцкая партыя Невіса. С.-К. і Н. — чл. ААН (з 1983).

Гаспадарка. Аснова эканомікі — сельская гаспадарка і сфера паслуг (абслугоўванне замежных турыстаў). Валавы ўнутр. прадукт на душу насельніцтва 6 тыс. дол. (1999). 5,5% яго ствараецца ў сельскай гаспадарцы, 22,5% — у прам-сці, 72% — у абслуговых галінах (укл. турызм). Краіну штогод наведвае каля 160 тыс. турыстаў, пераважна з ЗША і Вялікабрытаніі. Даход ад турызму 66 млн. дол. (1998). Гал. цэнтр — пас. Фрайгейт на в-ве Сент-Кітс. Для сельскай гаспадаркі выкарыстоўваюць 6,5 тыс. га, у т.л. пад ворывам і шматгадовымі насаджэннямі 5,7 тыс. га, пашай — 0,8 тыс. га. Гал. экспартныя культуры — цукр. трыснёг (каля $^1/_3$ ворных зямель), бавоўнік, какосавая пальма, арахіс. Вырошчваюць таксама бананы, рыс, кукурузу, ананасы, агародніну. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак (14 тыс. галоў), птушак (60 тыс. галоў, 1997). Насельніцтва традыцыйна займаецца рыбалоўствам. Апрацоўчая прам-сць прадстаўлена невял. прадпрыемствамі па вытв-сці цукру-сырцу, патакі-меласы, бавоўны, бавоўнянага і какосавага алею, алкагольных напіткаў, тэкстылю, абутку, фармацэўтычных вырабаў. Ёсць невял. прадпрыемствы па зборцы эл. і электронных прылад. Вытв-сць электраэнергіі 85

Герб і сцяг **Сент-Кітс і Невіс**.

млн. кВт·гадз. (1998). Даўж. аўтадарог 320 км, у т.л. з цвёрдым пакрыццём 136 км. На цукр. плантацыях в-ва Сент-Кітс ёсць вузкакалейная чыгунка даўж. 58 км. 2 аэрапорты, у т.л. міжнар. Голдэн-Рок (каля г. Бастэр). Марскія порты: Бастэр і Чарлстаўн. У 1997 экспарт склаў 43,7 млн. дол., імпарт — 129,6 млн. дол. У экспарце пераважаюць цукар-сырэц, патака-меласа (34%), бавоўна (20%), баваўняны і какосавы алей; у імпарце — машыны і абсталяванне, харч. прадукты, нафтапрадукты. Гал. гандл. партнёры: ЗША (68% экспарту і 42% імпарту), Вялікабрытанія (22% і 11%), краіны Карыбскага бас. Краіна атрымлівае дапамогу ад Вялікабрытаніі (каля 5,5 млн. дол. штогод). Грашовая адзінка — усх.-карыбскі долар.



Л.В.Лоўчая (прырода, насельніцтва, гаспадарка).

СЕНТ-КЛЕР ДЭВІ́ЛЬ (Sainte-Claire Deville) Анры Эцьен (11.3.1818, в-аў Сент-Томас, Віргінскія а-вы, ЗША — 1.7.1881), французскі хімік. Чл. Парыжскай АН (1861). Замежны чл.-кар. Пецярб. АН (1869). Скончыў Парыжскі ун-т (д-р медыцыны і хіміі; 1843). З 1845 праф. ун-та ў Безансоне, з 1851 Вышэйшай нармальнай школы ў Парыжы, у 1870—80 у Сарбоне. Навук. працы па агульнай і неарган. хіміі. Распрацаваў прамысл. спосаб атрымання алюмінію: аднаўленнем хларыду алюмінію метал. натрыем (1854), метады ачысткі плаціны (разам з А.Ж.Дэбрэ; 1855—59). Ажыццявіў класічныя даследаванні па тэрмічнай дысацыяцыі; паказаў, што малекулы вады, хлоравадароду, дыаксіду вугляроду пры высокіх т-рах дысацыіруюць (1857). Атрымаў сплаў плаціны з ірыдыем (1872), з якога былі выраблены міжнар. эталоны метра і кілаграма.

Літ.: Манолов К. Великие химики: Пер. с болг. Т. 1. 3 изд. М., 1986.

СЕНТ-ЛУ́ІС (Saint Louis), горад у цэнтр. ч. ЗША, у штаце Місуры. Засн. ў 1764. 339,3 тыс. ж., з прыгарадамі каля 2,5 млн. ж. (2000, частка прыгарадаў у штаце Ілінойс). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт на р. Місісіпі, ніжэй за ўпадзенне ў яе р. Місуры. Буйны прамысл., гандл.-фін. цэнтр і трансп. вузел Сярэдняга Захаду ЗША. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: авіяц., ракетна-касм., радыёэлектронная, эл.-тэхн., металаапр., аўтазборачная, нафтаперапр., хім., харчасмакавая, гарбарна-абутковая, паліграф., ваенная. Чорная і каляровая металургія, вытв-сць чыг. вагонаў. 7 ун-таў. Маст. музей. У С.-Л. адбыліся III летнія Алімп. гульні (1904).

СЕНТ-ЛЮСІ́Я (Saint Lucia), дзяржава ў Вест-Індыі на аднайм. востраве ў групе Наветраных а-воў (архіпелаг М. Антыльскія а-вы). Пл. 620 км^2. Нас. 156,3 тыс. чал. (2000). Афіц. мова — англійская, шырока распаўсюджаны мясц. крэольскі дыялект франц. мовы (патуа). Сталіца, найб. горад і порт — *Кастры*. Адм. падзел — 11 акруг. Нац. свята — Дзень незалежнасці (22 лют.).

Дзяржаўны лад. С.-Л. — канстытуцыйная манархія. Чл. Садружнасці. Дзейнічае канстытуцыя 1979. Кіраўнік дзяржавы — брыт. манарх, якога прадстаўляе ген.-губернатар. Орган заканад. улады — двухпалатны парламент, які складаецца з сената (11 чл., прызначаюцца ген.-губернатарам) і палаты сходу (17 чал., выбіраюцца насельніцтвам на 5 гадоў). Выканаўчую ўладу ажыццяўляе ўрад на чале з прэм'ер-міністрам (кіраўнік большасці ў палаце сходу).

Прырода. Востраў С.-Л. вулканічнага паходжання. Рэльеф горны, выш. да 959 м (г. Жымі). Клімат трапічны, пасатны. Сярэднемесячныя т-ры 18—26°С. Гадавая колькасць ападкаў ад 1500—1700 мм на ўзбярэжжы да 2500—3500 мм на ўсх. схілах гор. Ёсць гарачыя крыніцы. У гарах захаваліся вільготна-трапічныя лясы з каштоўнымі пародамі дрэў. Жывёльны свет прадстаўлены ў асн. птушкамі. Мора багатае рыбай, ракападобнымі і малюскамі. Ёсць некалькі рэзерватаў.

Насельніцтва. 96% складаюць сент-люсійцы, нашчадкі рабоў, прывезеных з Афрыкі, у антрапал. адносінах негры (больш за 90%) і мулаты. У гарадах невял. колькасць выхадцаў з Індыі і англічан. Вернікі пераважна католікі (90%), ёсць пратэстанты (7%) і англікане (3%). Сярэднегадавы прырост каля 1%. Сярэдняя шчыльн. каля 250 чал. на 1 км^2, на ўзбярэжжы каля 500 чал. на 1 км^2. Гарадскога насельніцтва больш за 50%. Найб. гарады: Кастры (з прыгарадамі больш за 50 тыс. ж., 2000), В'е-Фор, Міку, Суфрыер. У сельскай гаспадарцы занята 43% працаздольных, у прам-сці і гандлі — 18%, у абслуговых галінах — 39%. Значная эміграцыя, пераважна ў Вялікабрытанію.

Гісторыя. Стараж. насельнікі С.-Л. — індзейцы аравакі і карыбы, б.ч. якіх знішчана еўрапейцамі. Адкрыта Х.*Калумбам* у 1502. У 1605 тут засн. англ. пасяленне. У 17—18 ст. за валоданне С.-Л. ішла барацьба паміж Францыяй і Вялікабрытаніяй; канчаткова замацавана за апошняй паводле *Парыжскага мірнага дагавора 1814*. У 1958—62 чл. Вест-Індскай федэрацыі. З 1967 «асацыіраваная з Вялікабрытаніяй дзяржава». 22.2.1979 абвешчана незалежнасць С.-Л. ў складзе Садружнасці. У С.-Л. дзейнічаюць паліт. партыі: Аб'яднаная рабочая партыя С.-Л., Лейбарысцкая партыя, Прагрэсіўная лейбарысцкая партыя. С.-Л. — чл. ААН (з 1979).

Гаспадарка. С.-Л. — аграрная краіна сярэдняга ўзроўню развіцця, важнае значэнне для эканомікі мае замежны турызм. Валавы ўнутр. прадукт на 1 чал. складае 4100 дол. за год. 32% яго ствараецца ў прам-сці, 11% — у сельскай гаспадарцы, 57% — у абслуговых галінах, пераважна ў турысцкай справе. С.-Л. — краіна развітога міжнар. турызму (штогод наведваюць 300—350 тыс. замежных турыстаў, даход ад турызму ў 1998 — 291 млн. дол.). У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 22 тыс. га зямлі, у т.л. каля 19 тыс. га пад ворывам і шматгадовымі насаджэннямі, 3 тыс. га пад пашай. Пераважаюць дробныя сялянскія гаспадаркі, ёсць плантацыі экспартных культур. Каля палавіны с.-г. зямель пад пасадкамі бананаў (штогадовы збор каля 100 тыс. т). Вырошчваюць таксама манга, какосавыя арэхі, цытрусавыя, какаву, батат, маніёк, цукр. трыснёг, рыс, вінаград. Жывёлагадоўля мае другараднае значэнне. Пагалоўе (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы каля 15, свіней каля 10, авечак і коз каля 15. Птушкагадоўля (260 тыс. курэй у 1997). Марское рыбалоўства. Гал. прамысл. прадпрыемствы — нафтавы тэрмінал для перагрузкі супертанкераў (прывозяць нафту для ЗША з Б.Усходу) і нафтаперапр. з-д (б. ч. прадукцыі экспартуецца). Працуюць невял. прадпрыемствы па зборцы электронных кампанентаў, вытв-сці паперы і кардону, тытунёвых вырабаў, тканін, адзення, цацак. Апрацоўчая прам-сць базіруецца на перапрацоўцы мясц. с.-г. сыравіны (вытв-сць копры, какосавага алею, мыла, рому, безалкагольных напіткаў). Лесанарыхтоўкі і дрэваапр. прам-сць. Вытв-сць электраэнергіі — 110 млн. кВт·гадз. (1998). Развіты саматужныя промыслы (ганчарныя вырабы, сувеніры і інш.). Транспарт аўтамаб. і марскі. На востраве 1,2 тыс. км аўтадарог, у т.л. каля 100 км з цвёрдым пакрыццём, 10 тыс. легкавых аўтамабіляў, 9,1 тыс. грузавых і аўтобусаў; 2 міжнар. аэрапорты. Марскія парты Кастры і В'е-Фор. У 1997 экспарт склаў 70,1 млн. дол., імпарт — 292,4 млн. дол. У экспарце пераважаюць бананы (41% па кошце), нафтапрадукты, адзенне, какава, агародніна, фрукты, какосавы алей і копра, у імпарце — харч. і прамысл. тавары, паліва. Гал. гандл. партнёры: ЗША (24% экспарту, 36% імпарту), Вялікабрытанія (50% экспарту, 11% імпарту), карыбскія краіны (16% экспарту і 22% імпарту), Японія, Канада. Краіна атрымлівае эканам. дапамогу ад Вялікабрытаніі. Грашовая адзінка — усх.-карыбскі долар.

І.Я.Афнагель (прырода, насельніцтва, гаспадарка).

Герб і сцяг **Сент-Люсіі**.



СЕНТО, гл. *Арганізацыя цэнтральнага дагавору*.

СЕНТ-ПІ́ТЭРСБЕРГ (Saint Petersburg), горад на ПдУ ЗША, у штаце Фларыда. Засн. ў 1888. 236 тыс. ж., з г. Тампа і агульнымі прыгарадамі каля 2 млн. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог, марскі порт. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: радыёэлектронная, у т.л. вытв-сць навігацыйных прылад і інш. абсталявання, пераважна для ваен. мэт; паліграф., харчовая. Ун-т. Кліматычны курорт. Турызм.

СЕНТ-ПОЛ (Saint Paul), горад на Пн ЗША. Адм. ц. штата Мінесота. Засн. ў 1841. 257,3 тыс. ж., з г. Мінеапаліс і агульнымі прыгарадамі каля 2,6 млн. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт на р. Місісіпі (пачатак суднаходства). Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: паліграф., харч. (мясная, мукамольная і інш.), хім., радыёэлектронная, эл.-тэхн., аўтазборчая, металаапр., чорная металургія, ваенная. Ун-т.

СЕНТ-ХЕ́ЛЕНС (Saint Helens), горад на З Вялікабрытаніі, паміж гарадамі Манчэстэр і Ліверпул. Каля 200 тыс. ж. (2001). Прам-сць: шкляная (гал. цэнтр у краіне), маш-буд., каляровая металургія, хімічная. Здабыча каменнага вугалю.

СЕНТ-ЧАРЛЬЗ (Saint Charles), мыс на п-ве Лабрадор (Канада), крайні ўсх. пункт мацерыка Паўн. Амерыка (52°24' паўн. ш. і 55°40 зах. д.).

СЕНТЫМЕНТАЛІ́ЗМ (франц. sentimentalisme ад англ. sentimental пачуццёвы), плынь у еўрапейскай маст. культуры 2-й пал. 18 — пач. 19 ст. Сфарміравалася ў л-ры, тэатр., муз. і выяўл. мастацтвах пад уплывам ідэалогіі эпохі *Асветніцтва* і ранняга *рамантызму* як альтэрнатыва рацыяналістычнай зададзенасці і нарматыўнасці *класіцызму*. Узнікла пад уплывам дэмакратызацыі грамадскага жыцця, пераадольвання яго саслоўнай ізаляванасці, пераходу ад феад. да бурж. грамадскіх адносін, барацьбы за свабоду асобы і свабоднага выяўлення яе гуманных пачуццяў.

У літаратуры С. зарадзіўся ў Англіі ў канцы 1720-х г., сфарміраваўся там у 1740—50-я г. (С.Рычардсан, Дж. Томсан, Э.Юнг, Т.Грэй, Л.Стэрн і інш.), тэарэт. абгрунтаванне атрымаў у сац.-філас. і літ. творах Ж.Ж.Русо і ў грамадска-літ. руху *«Бура і націск»* (Германія). У рус. л-ры быў дваранскім гуманістычна-асветніцкім кірункам (М.Карамзін, І.Дзмітрыеў, В.Капніст, ранні В.Жукоўскі). Асаблівасць С. як літ.-

маст. і эстэт. плыні — яго недастатковая храналагічная акрэсленасць: сентыментальныя рэмінісцэнцыі і рэпрызы, характэрныя для большасці постклясіцысцкіх маст. метадаў і кірункаў — рамантызму, *крытычнага рэалізму, натуралізму, сацыялістычнага рэалізму,* некат. мадэрнісцкіх і постмадэрнісцкіх плыняў.

У бел. л-ры С. — адна з плыняў бел.-польскага рамантызму 1-й пал. 19 ст. Найб. поўна выявіўся ў творчасці Я.Чачота, Я.Баршчэўскага, часткова ў паэзіі У.Сыракомлі, ранняй паэзіі і драматургіі В.Дуніна-Марцінкевіча. Пры гэтым рамантычныя ідэалы дамінуюць у іх польскамоўнай паэзіі, а сентыментальная арыентацыя на маральнае асветніцтва, гармонію паміж класамі і саслоўямі грамадства, дыдактыку і зварот да простага народа — у бел. творах, разлічаных на сялянства і фальварковую шляхту (вершы Чачота «Да мілых мужыкоў», «Як добра, калі мужык...», «Плакала бяроза ды гаварыла...», «Паночкі, нашы кветачкі...», «Ой, чаму ж ты, зязюлечка...»; вершы Баршчэўскага «Дзеванька», «Да Юліі», балада «Дзве бярозы»). Класічнымі ўзорамі С. ў бел. л-ры з'яўляюцца лібрэта камічнай оперы Дуніна-Марцінкевіча «Сялянка» («Ідылія», 1844, апубл. 1846), яго вершаваная аповесць «Гапон» (1855), вершы «Літвінка», «Галубкі», «Смутак на чужыне», прасякнутыя ідэяй гармоніі грамадскіх адносін, акцэнтацыяй маральных крытэрыяў ацэнкі людскіх учынкаў, ідэалізацыяй натуральнай культуры і вясковага побыту, культам пачуццёвасці. Лепшыя здабыткі С. ўвайшлі ў бел. класічную і сучасную л-ру.

Вызначальным мастацтве і архітэктуры С. набыў некат. агульныя стылявыя прыкметы: пяшчотнасць, мяккасць мадэліроўкі і каларыстычных адценняў, паветранасць дэталей, вытанчанасць збудаванняў, прадметаў, фігур, лёгкасць, прастату і высакародства. Культ прыроды, натуральнага пачуцця, прыроджанай несапсаванасці людзей і маральнай чысціні нараджалі асаблівую духоўную атмасферу, у якой узнікалі маст. вобразы, поўныя шчырасці, душэўнай высакароднасці, прыроднай грацыі. Элегічныя і пастаральныя настроі, ідэалізацыя патрыярхальнага побыту, захапленне натуральнай прыродай наклалі адбітак на архітэктуру пейзажных паркаў і размешчаных у іх палацаў, павільёнаў, будынкаў, якія пераймалі сельскія і экзатычныя ўзоры (архітэктары У.Кент, У.Чэймберс у Вялікабрытаніі, Ж.А.Габрыэль, Р.Мік у Францыі, Ф.В.Эрдмансдорф у Германіі, Ч.Камерон, П.Г.Ганзага, В.Няелаў у Расіі). Для С. ўласцівы пяшчотныя, замілавальныя жаночыя, юнацкія і дзіцячыя вобразы (у скульптуры — Э.М.Фальканэ ў Францыі, М.Казлоўскі ў Расіі; у жывапісе — партрэты Т.Гейнсбара ў Вялікабрытаніі, Ж.Л.Вуаля, Э.-Л.Віжэ-Лебрэн у Францыі, У.Баравікоўскага ў Расіі), велічныя і меланхалічныя пейзажы з ант. руінамі і паркавымі пабудовамі (Ю.Рабер у Францыі, С.Шчадрын у Расіі). Папулярнасцю карысталіся творы Ж.Гроза, А.Каўфман, Ж.А.Фрагонара, В.Гісландзі, Ф.Гвардзі і інш. У бел. мастацтве рысы С. найб. праявіліся ў творах І.Аляшкевіча, С.Богуша-Сестранцэвіча, Н.Сілівановіча.

У тэатры тэарэт. абгрунтаванне С. далі Ж.Ж.Русо («Ліст да Д'Аламбера аб відовішчах», 1758), Л.С.Мерсье («Аб тэатры, ці Новы вопыт пра драматургічнае мастацтва», 1773), Я.Ленц («Заўвагі пра тэатр», 1774). Пад уплывам С. ўзніклі жанры «слёзнай камедыі», мяшчанскай драмы. Прыёмы С. выкарыстаны ў драматургіі «Буры і націску», п'есах П.Бамаршэ, у ранніх творах Ф.Шылера, у меладрамах. У акцёрскім мастацтве ўвага звярталася на ўнутраны свет герояў, іх пачуцці (у супрацьпастаўленні з рацыяналістычным класіцызмам з яго пафаснасцю, дэкламацыйнай рыторыкай). Маўленне акцёраў набліжалася да побытавых інтанацый. Сярод прадстаўнікоў С. акцёры Д.Гарык (Вялікабрытанія), А.Каратыгіна, Я.Шушэрын (Расія). У сцэнаграфіі замест традыц. «палацавых» залаў для трагедый і нейтральных статычных інтэр'ераў для камедый з'явіліся маляўнічыя пейзажы, прадметы побыту простага люду.

У бел. драматургіі і тэатры С. у самаст. кірунак не склаўся. Існаваў сумесна з інш. плынямі ў асобных прыёмах і матывах і меў выразна дэмакр. акрэсленасць (спагада да бедных, замілаванне роднай прыродай). На сумежжы класіцызму і С. напісана лібрэта М.Радзівіла да оперы Я.Голанда «Агатка, або Прыезд пана» (1784); матывы і элементы С. сустракаюцца ў «Сялянцы» Дуніна-Марцінкевіча, у жанрах драмы і меладрамы пач. 20 ст. («У іншым шчасці нячасце схавана» К.Каганца, «Блуднікі» Л.Родзевіча, «Сягонняшнія і даўнейшыя» К.Буйло, «Апошняе спатканне» і «Ганка» У.Галубка, «На Купалле» М.Чарота, «Чырвоныя кветкі Беларусі» В.Гарбацэвіча і інш.). У сцэн. мастацтве найб. выразна рысы С. выявіліся ў спектаклях Бел. вандроўнага т-ра ў 1-й пал. 1920-х г.

У музыцы быў звязаны з аднайменным літ. кірункам. Тэарэтыкі С. (К.Ф.Э.Бах, Ж.Ж.Русо, Д.Шубарт і інш.) лічылі музыку «мовай пачуццяў», здольнай «закрануць сэрцы слухачоў», адметная рыса якой — выразнасць мелодыі. Пад уздзеяннем С. ўзбагацілася вобразна-жанравая палітра музыкі, у оперы пашырылася супрацьлеглая класіцыстычнай эстэтыцы тэндэнцыя змешвання жанраў, у камічнай оперы, у т.л. ў Расіі — элементы драматызму, якія набліжалі яе да «слёзнай камедыі» («Добрая дачка» Н.Пічыні і інш.). Узнік новы муз.-драм. жанр — *меладрама.* У інстр. музыцы С. часткова праявіўся ў творчасці кампазітараў *мангеймскай школы.* С. спрыяў росквіту сольнай песні з інстр. суправаджэннем любоўнага зместу: песні кампазітараў берлінскай школы, «расійская песня» (Ф.Дубянскі, В.Казлоўскі, Р.Цяплоў).

Літ.: Маркус С.А. История музыкальной эстетики. Т.1. М., 1959; Музыкальная эстетика Западной Европы XVII — XVIII вв. М., 1971; Дорошевич Э., Конон В. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии. Мн., 1972; Тарасюк Л.К. Мастацкія кірункі і плыні ў беларускай паэзіі XIX — пачатку XX ст. Мн., 1999.

У.М.Конан (літаратура), *А.В.Сабалеўскі* (тэатр), *Ю.Дз.Златкоўскі* (музыка).

А. дэ **Сент-Экзюперы.**

СЕНТ-ЭКЗЮПЕРЫ́ (Saint-Exupéry) Антуан дэ (29.6.1900, г. Ліён, Францыя — 31.7.1944), французскі пісьменнік. У 1919—21 вучыўся ў Парыжскай АМ. З 1926 грамадз. лётчык, з 1933 лётчык-выпрабавальнік, у 2-ю сусв. вайну — ваен. лётчык. Загінуў, выконваючы разведвальны палёт. Друкаваўся з 1926. У раманах «Паўднёвы паштовы» (1929), «Начны палёт» (1931), «Планета людзей» (1939, прэмія Франц. акадэміі), аповесцях «Ваенны лётчык» (1942), «Ліст да заложніка» (1943) услаўляў мужнасць подзвігу, вернасць абавязку, патрыятызм. Яго творы — своеасаблівы сплаў рэпартажу з паэт. і філас. асэнсаваннем перажытага. Сусв. вядомасць набыла філас.-лірычная казка «Маленькі прынц» (1943, неаднаразова экранізавана), у якой паэтычнасць, лірызм, сатыра спалучаюцца з глыбокім роздумам аб прыгажосці чалавечых адносін. На бел. мову асобныя творы С.-Э. пераклалі Э.Агняцвет, М.Валошка, Н.Мацяш.

Тв.: Бел. пер. — Планета людзей. Маленькі прынц // Олдрыдж Дж. Паляўнічы; Хемінгуэй Э. Стары чалавек і мора; Сент-Экзюперы А. Планета людзей. Маленькі прынц. Мн., 1996; Рус. пер. — Избранное. М., 1987.

Літ.: Мижо М. Сент-Экзюпери: Пер. с фр. 2 изд. М., 1965; Буковская А. Сент-Экзюпери, или Парадоксы гуманизма: Пер. с пол. М., 1983; Антуан де Сент-Экзюпери: Биобиблиогр. указ. М., 1966.

СЕНТ-ЭЦЬЕ́Н (Saint-Étienne), горад у цэнтр. ч. Францыі. Адм. ц. дэпартамента Луара. Каля 250 тыс. ж., разам з суседнімі гарадамі і пасёлкамі каля 350 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: чорная металургія (выплаўка высакаякаснай сталі), ваен., маш.-буд., трыкатажная. Здабыча каменнага вугалю. Ун-т. Музей мастацтва і прам-сці. Касцёл Сент-Эцьен (14—15 ст.).

СЕНУСІ́ТЫ, члены мусульманскага рэліг.-палітычнага брацтва (тарыката) сенусія,

заснаванага ў 1837 у г. Мекка Мухамедам ібн Алі ас-Сенусі. С. заклікалі да аднаўлення «чысціні» першапачатковага ісламу і свяшчэннай вайны (*джыхада*) супраць іншаверцаў; асаблівае месца ў абраднасці С. займае ўслаўленне прарока Мухамеда. У 1843 ас-Сенусі перанёс сваю дзейнасць у Кірэнаіку (Лівія), якая стала гал. апорай руху С. Кіраўнікі брацтва — нашчадкі ас-Сенусі сталі фактычнымі правіцелямі Кірэнаікі; Мухамед аш-Шарыф узначаліў у 1911—31 барацьбу супраць італьян. акупацыі, Мухамед Ідрыс быў каралём незалежнай Лівіі [1951—69]. Пасля антыманархічнай рэвалюцыі 1969, нягледзячы на захады ўрада М.*Кадафі*, працягваюць адыгрываць важную ролю ў жыцці Усх. Лівіі, дзе складаюць каля трэці насельніцтва.

СЕ́НЦЫ, зрубная (радзей дашчаная) прыбудова да хаты з боку ўваходу або памяшканне, якое злучае хату з інш. жылой ці гасп. пабудовай. Уваход у С. часта вылучаецца ганкам або верандай. С. больш надзейна захоўваюць цяпло ў жылых памяшканнях. Вядомы ў нар. жыллі многіх краін свету. Узніклі ў старажытнасці з развіццём шматкамерных жылых дамоў.

У бел. нар. 2-камерным жыллі С. — зрубная (у выглядзе трысцена), радзей каркасная (з дошак, дыляў, плятня) прыбудова да жылога зруба; у 3-камерным жыллі С. злучалі 2 жылыя памяшканні або жылое памяшканне з клецню ці істопкай. У сял. жыллі да пач. 20 ст. С. нярэдка не мелі столі і драўлянага памоста, служылі дапаможным памяшканнем, дзе знаходзіліся рознае начынне і прылады працы. Часам С. выкарыстоўвалі як рамесную майстэрню. У С. звычайна адгароджвалася камора, у бедных сялян — закут для жывёлы. У цэнтры і на Пд Беларусі пад С. рабілі скляпы. Летам у С. спалі. У жыллі шляхты з 16 ст. С. нярэдка абграваліся камінам. У багатых сядзібах С. былі падобныя да прыхожай, у іх стаялі сталы, лавы і інш. мэбля. Ператварэнню С. у параднае памяшканне садзейнічаў іх падзел на 2 часткі: парадныя С., якія былі злучаны з жылымі пакоямі, і гасп., што злучалі жылую і гасп. часткі дома.

Літ.: Беларускае народнае жыллё. Мн., 1973; Помнікі этнаграфіі. Мн., 1981.

Ю.А.Якімовіч.

СЕ́НЧАНКА Іван Яфімавіч (12.2.1901, с. Натальіна Чырванаградскага р-на Харкаўскай вобл., Украіна — 9.11.1975), украінскі пісьменнік. Скончыў Харкаўскі ін-т нар. адукацыі (1928). Друкаваўся з 1921. Аўтар зб-каў лірыка-псіхал. быт. апавяданняў «Вясною» (1923), «Апавяданні» (1925), «Дубовыя грады» (1929), «Камуна» (1932), «Навелы» (1940), «Рубін на Саламянцы» (1957), «На Батыевай гары» (1960), «Падарожжа ў Чырванаград» (1973), раманаў «Металісты» (1932), «Напярэдадні» (1938), «Яго пакаленне» (1947). Творы прысвечаны жыццю ўкр. вёскі і гар. ускраіны. Пісаў для дзяцей: зб-кі «Паравы млын» (1926), «Сонца ўзыходзіць» (1929), «Чорныя вароты» (1936), «Мае сябры» (1951), «Дарогі блізкія і далёкія» (1965), «Дыямантавы бераг» (1962, 1969). Аўтар кн. нарысаў «Гіганты пустынь» (1932), «Права на гераізм» (1934). На бел. мову асобныя апавяданні пераклаў М.Базарэвіч.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Ад круч дняпроўскіх. Мн., 1983.

СЕ́НЬКАВА, вёска ў Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 48 км на Пн ад горада і чыг. ст. Верхнядзвінск, 198 км ад Віцебска. 357 ж., 140 двароў (2001). Базавая школа, клуб, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму.

СЕПАРА́ТАР (лац. separator аддзяляльнік), 1) апарат (машына, прыстасаванне) для раздзялення (*сепарацыі*) цвёрдых або вадкіх сумесей, аддзялення ад іх дамешкаў, выдалення цвёрдых ці вадкіх часцінак з газу. Дзеянне заснавана на адрозненні фіз. уласцівасцей кампанентаў сумесі: формы часцінак, масы, шчыльнасці рэчыва, магн., эл. і інш.

Найб. пашыраны С. цэнтрабежныя, магнітныя, электрастатычныя, пнеўматычныя, адстойныя (гравітацыйныя). Для раздзялення эмульсій і асвятлення вадкасцей выкарыстоўваюцца звычайна С. цэнтрабежнага тыпу — *цэнтрыфугі*; для мех. ачысткі газаў — газавыя С. і *цыклоны*; для аддзялення ад якога-н. прадукту больш лёгкіх дамешкаў — пнеўматычныя С., у якіх ачыстка робіцца з дапамогай паветр. струменю. Выкарыстоўваюцца для *абагачэння карысных выкапняў*, ачысткі газавых свідравін ад вільгаці, сепарацыі малака, асвятлення піва і інш.

2) Метал. або пластмасавая абойма *падшыпнікаў* качэння, выразы (ячэйкі) якой утрымліваюць целы качэння (шарыкі, ролікі) на пэўнай адлегласці адно ад аднаго.

Сепаратар гравітацыйны (вінтавы).

СЕПАРА́ТАР МАЛО́ЧНЫ, апарат для раздзялення *малака* на вяршкі і адгон і ачысткі яго ад мех. дамешкаў. Сепарацыя адбываецца ў стальным барабане, які мае сістэму канічных талерак з верт. каналамі. Пры вярчэнні барабана (6—12 тыс. абаротаў за мінуту) малако па каналах расцякаецца ў міжталерачныя зазоры, дзе пад дзеяннем цэнтрабежнай сілы адгон як больш цяжкі адкідваецца на перыферыю, падымаецца ўгору і выходзіць праз адтуліну. Вяршкі збіраюцца каля восі барабана, па каналах талеркатрымальніка падымаюцца ўверх і выцякаюць у збіральнік. Прадукцыйнасць С.м. да 5 тыс. л/гадз.

В.М.Кандрацьеў.

СЕПАРА́ТНЫ МІР (ад лац. separatus аддзелены), мірны дагавор або перамір'е, заключаныя з праціўнікам адной з дзяржаў, што ўваходзілі ў кааліцыю краін, якія вялі вайну, без ведама або згоды сваіх саюзнікаў. Звычайна заключаецца да агульнага спынення вайны. Тэрмін «С.м.» выкарыстоўваўся ў час 1-й сусв. вайны 1914—18, калі спробы заключыць С.м. неаднаразова рабіліся дзяржавамі герм. кааліцыі. Гл. *Брэсцкі мір 1918.*

СЕПАРАТЫ́ЗМ (франц. séparatisme ад лац. separatus аддзелены), тэорыя, палітыка і практыка адасаблення, аддзялення часткі тэр. дзяржавы з мэтай стварэння новай самаст. дзяржавы або атрымання статуса вельмі шырокай аўтаноміі. Адрозніваюць разнастайныя формы С.: буйных і малых народаў, этнічны, племянны і інш. С. ўласціва небяспечная логіка самаразвіцця, згодна з якой сепаратысцкія імкненні пастаянна ўзнаўляюцца на больш нізкіх узроўнях. З'яўляецца вынікам гіст., сац., паліт., канфесіянальных і інш. праблем, а таксама ваяўнічага *нацыяналізму*. Тыповай падставай узнікнення сепаратысцкіх тэндэнцый у дзярж. жыцці служыць нераўнамернасць сац.-эканам. развіцця рэгіёнаў і тэрыторый унутры дзяржавы, размеркавання паміж імі прыродных багацняў або парушэнне правоў чалавека (нац., расавых). Напр., у Італіі існу-



Схема **сепаратара малочнага**: 1 — барабан; 2 — пакет талерак; 3 — талеркатрымальнік; 4 — паплаўковая камера; 5 — паплавок; 6 — верацяно; 7 — электрарухавік з механізмам прывода.

юць сепаратысцкія тэндэнцыі, прыхільнікі якіх патрабуюць аддзялення высокаразвітай Поўначы краіны ад яе менш развітога Поўдня; у Іспаніі сепаратысцкі рух падтрымлівае частка баскаў. Складаныя і вострыя праблемы на глебе С. ўзнікаюць у Індыі, Пакістане, Турцыі, Іраку, Расіі, Грузіі, Малдове і інш. (разрыў эканам. і паліт. сувязей з цэнтрам, спробы драблення адзінай дзяржавы і самаізаляцыя адасобленых яе частак). У адрозненне ад права нацый на самавызначэнне, дзе бярэцца пад увагу воля большасці нацыі, С. не карыстаецца міжнар.-прававой абаронай. Сродкамі рэалізацыі мэт С. часта служаць узбр. барацьба і тэрарызм, што абумоўлівае неабходнасць прававога абмежавання і нейтралізацыі незаконных дзеянняў. *В.І.Боўш.*

СЕПАРА́ЦЫЯ (лац. separatio аддзяленне), раздзяленне на састаўныя часткі цвёрдых або вадкіх сумесей, аддзяленне вадкіх або цвёрдых часцінак ад газу, цвёрдых ад вадкасці. Робіцца *сепаратарамі*. Пры С. кампаненты, якія раздзяляюцца, не мяняюць свайго хім. саставу. С. ў цеплаэнергетыцы выкарыстоўваецца для аддзялення вады ад насычанай пары, што ўтвараецца ў *цеплагенератарах*.

СЕ́ПІ, атрад галаваногіх малюскаў, гл. *Каракаціцы*.

СЕПІ́Р (Sapir) Эдуард (26.1.1884, г. Лаўэнбург, Германія — 4.2.1939), амерыканскі моваznавец і этнолаг. Чл. Амер. акадэміі мастацтваў і навук. Скончыў Калумбійскі ун-т (1904). З 1925 праф. Чыкагскага, з 1931 Ельскага ун-таў. Вывучаў мову і культуру індзейцаў Амерыкі, праблемы агульнага моваznаўства і этналінгвістыкі. Асн. праца — «Мова» (1921), дзе трактаваў мову як структуру; апісаў працэсы развіцця моў свету і даў іх тыпалагічную класіфікацыю, якая выкарыстоўваецца ў сучаснай амер. *структурнай лінгвістыцы*. Гіпотэза С. — Уорфа пра тое, што кожная мова своеасабліва адлюстроўвае свет, выкарыстоўваецца сучаснай этналінгвістыкай і *неабіхевіярызмам*.

СЕ́ПІЯ (лац. sepia ад грэч. sēpia *каракаціца*), светла-карычневае фарбавальнае рэчыва. Натуральную С. вырабляюць з сакрэту т.зв. *чарнільнага мяшка* галаваногіх марскіх малюскаў — сепій (адсюль назва). У 20 ст. С. — штучная карычневая акварэльная фарба шматлікіх адценняў. С. наз. таксама від графічнай тэхнікі, пашыраны ў Еўропе з сярэдзіны 18 ст. (Ж.А.*Фраганар* у Францыі і інш.).

СЕПТАКО́РД, гл. ў арт. *Акорд*.

СЕПТАРЫЁЗЫ, белая плямістасць, хваробы раслін, якія выклікаюцца патагеннымі грыбамі роду *септорыя*. Пашкоджваюць лісце, радзей сцёблы і плады з утварэннем белых плям (адсюль другая назва) з цёмным абадком. Пашыраны ўсюды. На Беларусі найб. шкодзіць збожжавым культурам, памідорам, грушы, парэчкам, агрэсту, маліне.

Развіццю хваробы спрыяе вільготнае надвор'е і т-ра паветра 20—23 °С. На верхнім баку плям развіваюцца пікніды (з пікнаспорамі) грыба ў выглядзе чорных крапінак. Пры С. заўчасна ападае моцна пашкоджанае лісце, расліна аслабляецца, ураджай часам зніжаецца на 30—50%.

СЕПТО́РЫЯ (Septoria), род недасканалых грыбоў сям. сферапсідальных. Больш за 1000 відаў. Пашыраны ўсюды, асабліва ў рэгіёнах з умераным, мяккім і вільготным кліматам. На Беларусі каля 200 відаў. Паразіты злакавых, складанакветных, яснотkавых, ружавых, парасонавых раслін, узбуджальнікі *септарыёзаў*. Найб. вядомыя С.: злакавая (S.graminis), памідоравая (S.lycopersici), пшанічная (S.tritici), ячная (S.hordei).

Міцэлій добра развіты, галінасты, шматклетачны, мае перагародкі з порамі, часам утварае *склероцыі*. Органы канідыяльнага спараношэння (*пікніды*) адзіночныя, шарападобныя, бураватыя, размешчаныя ў тканцы раслiны. *Канідыі* цыліндрычныя, бясколерныя, аднаклетачныя або шматклетачныя. *С.І.Бельская.*

СЕ́ПТЫМА, 1) у вершаскладанні тое, што *сэміradкоўе*. 2) У музыцы — гл. ў арт. *Інтэрвал*.

СЕПТЫ́МІЙ СЕВЕ́Р Луцый (Lucius Septimius Severus; 11.4.146, г. Вялікі Лептыс, Паўн. Афрыка — 4.2.211), рымскі імператар у 193—211, заснавальнік дынастыі *Севераў*. Быў квестарам, нар. трыбунам, консулам, сенатарам, кіраваў шматлікімі правінцыямі. З 190 камандаваў войскамі ў Германіі. Абвешчаны імператарам легіёнамі ў Панноніі. Абапіраўся на салдат, якім даў шэраг прывілеяў. Кіраваў з дапамогай імператарскага савета. Праводзіў антысенацкую палітыку. Увёў цэнзуальную сістэму падаткаабкладання і прымусовых павіннасцей (працоўных, ваен. і інш.). Умацаваў дунайскую, рэйнскую, брытанскую і ўсх. граніцы імперыі. Паспяхова змагаўся супраць *парфян*, у гонар перамогі (у 203) пабудаваў у Рыме Трыумфальную арку.

СЕПТЫМО́НЦЫУМ (лац. Septimontium ад septem сем + mons узгорак), 7 узгоркаў на левым беразе р. Тыбр (Авенцін, Вімінал, Квірынал, *Капітолій*, Палацін, Эсквілін, Цэлій), на якіх узнік *Рым*. Напачатку горад склаўся на Капітоліі і Палаціне (6 ст. да. н. э.), потым пашырыўся на суседнія ўзгоркі, нізіну да лукавіны р. Тыбр (Марсава поле) і перакінуўся на яе правы бераг (3 ст. да н. э.). Яго грамадскімі цэнтрамі былі Капітолій і комплексы *Рымскага форума*. У сучасным Рыме ўзгоркі С. адзначаюць гіст. цэнтр горада.



Септымій Север Луцый.

СЕПТЭ́Т (ад лац. septem сем), 1) ансамбль з 7 выканаўцаў. 2) Муз. твор для 7 выканаўцаў (інструменталістаў або вакалістаў); адзін з відаў *камернай музыкі* (як і *квартэт*, *квінтэт* і *секстэт*). Для С. характэрна *санатна-цыклічная форма*, пашыраны інш. цыклічныя (*сюіта*) і нецыклічныя формы. Найб. вядомыя септэты Л.Бетховена, І.Гумеля, П.Хіндэміта, І.Стравінскага. Вакальныя С. пераважна ўваходзяць у оперы. У бел. музыцы прадстаўлены ў творчасці Я.Касалапава, П.Падкавырава, М.Русіна. *Т.А.Дубкова.*

СЕ́РА (лац. Sulfur), S, хімічны элемент VI групы перыяд. сістэмы, ат. н. 16, ат.

Септарыёзы: 1 — грушы; 2 — маліны; 3 — жыта; 4 — пшаніцы (пашкоджаныя: а — зярняўка; б — каласок; в — расліна).

м. 32,066; адносіцца да *халькагенаў*. Прыродная С. складаецца з 4 стабільных ізатопаў з масавымі лікамі 32—34 і 36; асн. з'яўляецца ^{32}S (95,02%). У зямной кары $5 \cdot 10^{-2}$% па масе; трапляецца ў свабодным стане (гл. *Сера самародная*) і ў выглядзе сульфідных (*пірыт, галеніт, кінавар* і інш.) і сульфатных (*гіпс, барыт, ангідрыт, мірабіліт* і інш.) мінералаў. Злучэнні С. ёсць у вуглях, сланцах, нафце, прыродным газе. Адзін з найважн. біягенных элементаў. Вядома з глыбокай старажытнасці.

Неметал. Да т-ры 95,39 °С устойлівая рамбічная мадыфікацыя С. (α-S) — лімоннажоўтыя крышталі, шчыльн. 2070 кг/м^3, $t_{пл}$ 112,8 °С, пры т-ры вышэй за 95,39 °С і да $t_{пл}$ 119,3 °С — манаклінная (β-S) — мядоважоўтыя крышталі, шчыльн. 1960 кг/м^3. Вядомы і інш. мадыфікацыі С., напр., пры рэзкім ахаладжэнні расплаўленай С. атрымліваюць аморфную С. (шчыльн. 1920 кг/м^3). Дыэлектрык (шырыня забароненай зоны для α-S 2,6 эВ); цвёрдая С. — дыямагнетык. Не раствараецца ў вадзе, добра раствараецца ў серавугляродзе, феноле. Пры награванні непасрэдна ўзаемадзейнічае з усімі (акрамя ёду, азоту і інертных газаў) неметаламі (гл. *Серы аксіды, Серы фтарыды, Серы хларыды, Серавуглярод, Серавадарод*) і металамі (акрамя золата і плаціны) з утварэннем *сульфідаў*. Ступень акіслення С. ў злучэннях -2, +2, +4, +6. Вядомы шматлікія *сераарганічныя злучэнні*. Атрымліваюць з самародных руд, а таксама акісленнем серавадароду або аднаўленнем дыаксіду серы. Выкарыстоўваюць пераважна для атрымання сернай к-ты (прыкладна 50% вырабляемай С.), сульфітаў, барацьбы са шкоднікамі с.-г. культур, вулканізацыі гумы, а таксама ў вытв-сці фарбавальнікаў, выбуховых рэчываў, штучнага валакна, сульфідаў і інш.; уваходзіць у склад галовак запалак (серка), мазей для лячэння скурных хвароб. Пыл С. раздражняе органы дыхання, слізістыя абалонкі; ГДК у паветры 0,07 мг/м^3.

СЕ́РА САМАРО́ДНАЯ, мінерал класа самародных элементаў, S. Часам мае ізаморфныя прымесі селену, тэлуру, мыш'яку і мех. прымесі гліністага або арган. рэчыва. Крышталізуецца ў рамбічнай і манаклінная сінганіях. Утварае дыпірамідальныя, дысфенаідальныя і таблітчастыя крышталі, крышт. агрэгаты, суцэльныя і зямлістыя масы, нацёчныя, ныркападобныя формы і налёты. Колер жоўты, розных адценняў. Бляск алмазны да тлустага. Цв. 1—2. Шчыльн. 2,05—2,08 г/см^3. Крохкая. Паходжанне вулканагеннае, гіпергеннае (пры выветрыванні сульфідаў і разлажэнні гіпсаносных асадкавых тоўшчаў) і арганагеннае. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці сернай кіслаты, фарбавальнікаў, штучнага валакна, у папяровай і гумавай прам-сці, сельскай гаспадарцы. Радовішчы ў ЗША, Італіі, Іспаніі, Чылі, Японіі, Расіі, на Украіне.

СЕРААРГАНІ́ЧНЫЯ ЗЛУЧЭ́ННІ, рэчывы, малекулы якіх маюць атамы *серы*, злучаныя з атамамі вугляроду непасрэдна або праз гетэраатамы, найчасцей атамы кіслароду і азоту. Да С.з. адносяцца тыолы (*меркаптаны*), *сульфакіслоты, сульфіды арганічныя, сульфаты* арганічныя, сульфоніевыя злучэнні (гл. *Оніевыя злучэнні*) і інш., а таксама гетэраараматычныя злучэнні, найважн. з іх — *тыяфен* і *тыазол*. Разнастайнасць С.з. абумоўлена спецыфічнымі ўласцівасцямі серы, якая з'яўляецца адным з асн. *арганагенаў*. С.з. пашыраны ў прыродзе: амінакіслоты — *цыстэін, цысцін* і *метыянін*, вітаміны — *тыямін, біяцын, ліпоевая кіслата*, ёсць у высокасярністай нафце, кам.-вуг. і сланцавых смолах, прыродным газе некат. радовішчаў. Выкарыстоўваюць у прам-сці як фарбавальнікі, экстрагенты, манамеры, антыаксіданты, растваральнікі і інш., многія прыродныя і сінт. як лек. прэпараты (напр., антыбіётыкі пеніцылін і цэфаласпарын, сульфаніламідныя прэпараты).

Я.Г.Міляшкевіч.

Сера самародная.

СЕРАБАКТЭ́РЫІ, бактэрыі, якія акісляюць неарган. злучэнні серы і малекулярную серу; звычайна акісляюць серавадарод і інш. злучэнні серы да сернай к-ты. Да С. адносяць шэраг фотааўтатрофных пурпуровых і зялёных, бясколерныя хематрофныя (напр., з роду тыёбацылус), ніткаватыя слізготныя (напр., з роду тыётрыкс), аднаклетачныя формы (напр., з роду тыёбактэрыум) і інш. бактэрыі. Пашыраны ў вадзе, грунтах мораў, азёр, серных крыніц і інш. вадаёмаў, якія маюць серавадарод, трапляюцца ў глебе, радовішчах серы і сульфідных мінералаў. Удзельнічаюць у кругавароце серы ў прыродзе і прадухіляюць намнажэнне ў вадзе таксічнага серавадароду. Некат. С. выкарыстоўваюць для вышчалочвання металаў з руды. У выніку ўтварэння сернай к-ты С. бываюць прычынай разбурэння мураваных і бетонных збудаванняў, карозіі металаў, абсталявання ў шахтах і інш.



З.**Серабракова**. За туалетам. Аўтапартрэт. 1909.

СЕ́РА-БАЛІ́ВАР (Cerro Bolivar), група жалезарудных радовішчаў у Венесуэле. Адкрыты ў 1947 (7 радовішчаў), найб. Сера-Балівар. Паводле паходжання метамарфізаваныя. Руды — жалезістыя кварцыты і гематытавыя. Агульныя запасы каля 850 млн. т. руды, з сярэдняй колькасцю жалеза 62—63%.

СЕРАБРА́ ГАЛАГЕНІ́ДЫ, неарганічныя хім. злучэнні *серабра* з *галагенамі*. Найб. пашыраны фтарыд AgF, хларыд (у прыродзе мінерал хлораргірыт) AgCl, брамід (бромаргірыт) AgBr, ёдыд (ёдаргірыт) AgJ.

Крышт. рэчывы; AgCl бясколерны, астатнія С.г. жоўтага колеру. Практычна нерастваральныя ў вадзе (за выключэннем AgF). Раствараюцца ў водным аміяку з утварэннем комплексных аміякатаў. Святлоадчувальныя; пад уздзеяннем святла раскладаюцца з вылучэннем метал. серабра. Атрымліваюць узаемадзеяннем серабра з галагенамі або з канцэнтраванымі растворамі галагенавадародных кіслот, нерастваральныя — абменным узаемадзеяннем *серабра нітрату* з адпаведнымі растваральнымі галагенідамі. Хларыд, брамід і ёдыд выкарыстоўваюць для вытв-сці святлоадчувальных матэрыялаў (*папера фатаграфічная, плёнка* кіна- і фатаграфічная); хларыд як дэтэктар касм. выпрамяненняў, для вырабу элементаў аптычнай часткі інфрачырв. спектрометраў; брамід як каталізатар у арган. сінтэзе; ёдыд пры гальванічным серабрэнні, як крыніцу цэнтраў крышталізацыі вады ў воблаках пры барацьбе з градам.

СЕРАБРА́ НІТРА́Т, неарганічнае хім. злучэнне, соль *серабра*, $AgNO_3$. Бясколерныя крышталі, шчыльн. 4350 кг/м^3, $t_{пл}$ 209,7 °С. Добра раствараецца ў вадзе, спіртах. Пад уздзеяннем арган. і неарган. аднаўляльнікаў, святла і пры награванні лёгка аднаўляецца да серабра. У прам-сці атрымліваюць узаемадзеяннем серабра з азотнай к-той. Выкарыстоўваюць для атрымання інш. злучэнняў серабра, для серабрэння люстраў, як вяжучы бактэрыцыдны сродак (*ляпіс*), у вытв-сці фатагр. эмульсій, аналіт. хіміі (рэагент у аргентаметрыі).

СЕРАБРАКО́ВА Зінаіда Яўгенаўна (12.12.1884, с. Няскучнае Курскай вобл., Расія — 19.9.1967), рускі жывапісец. Дачка Я.А.*Лансерэ*. Вучылася ў Пецярбургу ў школе-майстэрні кн. М.К.Ценішавай (з 1902) і ў майстэрні В.Э.Браза (1903—05). Чл. аб'яднання «*Свет мастацтва*». З 1924 жыла ў Парыжы. Аўтар партрэтаў ню, кампазіцый, прысвечаных жыццю рус. вёскі, у якіх імкнулася да стварэння ідэальна прыгожых, гарманічных жаночых воб-

разаў. Жывапіснай манеры ўласцівы дэкаратыўнасць, ураўнаважанасць кампазіцыі, дакладнасць малюнка, лаканічны характар пісьма: «За туалетам. Аўтапартрэт» (1909), «У лазні» (1913), «За сняданкам» (1914), «Жніво» (1915), «Бялення палатна» (1917), аўтапартрэт (1922), «Калівур. Каця на тэрасе» (1930) і інш.

Літ.: Лапшин В. З.Серебрякова: [Альбом]. М., 1969; Савинов А.Н. З.Е.Серебрякова. Л., 1973; Князева В.П. З.Е.Серебрякова. М., 1979.

СЕРАБРАКО́Ў Павел Аляксеевіч (28.2.1909, г. Валгаград, Расія — 17.8.1977), расійскі піяніст, педагог. Нар. арт. СССР (1962). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1930), выкладаў у ёй (з 1939 праф.; у 1938—51 і з 1961 рэктар). Вядомы як інтэрпрэтатар фартэп'яннай музыкі Л.Бетховена, П.Чайкоўскага, першы выканаўца шэрагу твораў сав. кампазітараў. Ігра С. была адметная віртуознасцю, маштабнасцю, эмацыянальнасцю.

Літ.: Растопчина Н. П.А.Серебряков. Л., 1970.

СЕРАБРА́НКА, вёска ў Доўскім с/с Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл., на аўтадарозе Рагачоў—Слаўгарад. Цэнтр вытв. с.-г. кааператыва. За 25 км на У ад горада і чыг. ст. Рагачоў, 96 км ад Гомеля. 547 ж., 207 двароў (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Каля вёскі курганны могільнік (11—12 ст.). У Вял. Айч. вайну у вёсцы дзейнічала *Серабранскае камсамольска-маладзёжнае падполле.*

СЕРАБРА́НСКАЕ КАМСАМО́ЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала з вер. 1941 да студз. 1944 у в. Серабранка Журавіцкага (цяпер Рагачоўскага) р-на Гомельскай вобл. Аб'ядноўвала 14 чал. (кіраўнікі М.А.Дзмітрыеў, Н.І.Левянкова, М.Ц.Патапенка). Падпольшчыкі вялі агітацыю сярод насельніцтва, распаўсюджвалі лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро, здабывалі і перадавалі партызанам зброю, разведданыя пра ням. гарнізоны ў Гомелі, Бабруйску, Рагачове, Слаўгарадзе, Карме, прадукты, медыкаменты, праводзілі дыверсіі, двойчы сарвалі вываз у Германію жыхароў вёскі.

СЕРАБРО́ (лац. Argentum), срэбра, Ag, хімічны элемент I групы перыяд. сістэмы, ат. н. 47, ат. м. 107,8682; адносіцца да *высакародных металаў*. Прыроднае С. складаецца з 2 стабільных ізатопаў; ^{107}Ag (51,35%) і ^{109}Ag. Самы пашыраны з высакародных металаў; у зямной кары $7 \cdot 10^{-6}$% па масе. Трапляецца ў свабодным стане (*Серабро самароднае*) і ў выглядзе мінералаў (гл. *Срэбраныя руды*). Вядома з глыбокай старажытнасці.

Бліскучы метал белага колеру, мяккі і пластычны, $t_{пл}$ 961,93 °С, $t_{кіп}$ 2167 °С, шчыльн. 10491 кг/м^3. Мае найб. з усіх металаў цепла- і электраправоднасць, высокую адбівальную здольнасць (С., асаджанае ў вакууме на шкло, адбівае 95% бачнага святла). Хімічна мала актыўнае. У паветры не акісляецца. Пры пакаёвай т-ры ў прысутнасці кіслароду ўзаемадзейнічае з *серавадародам* з утварэннем чорнага сульфіду Ag_2S (вырабы з С. ў паветры цямнеюць). Раствараецца ў азотнай (утвараецца *серабра нітрат* $AgNO_3$) і гарачай канцэнтраванай сернай к-тах. З галагенамі ўтварае *серабра галагеніды*. Пры награванні ўзаемадзейнічае з халькагенамі, фосфарам, мыш'яком і вугляродам. Вядомы шматлікія *комплексныя злучэнні* С., у якіх каардынацыйны лік С. роўны 2, 3 і 4, напр., комплексныя цыяніды шчолачных металаў $M^I[Ag(CN)_2]$. З інш. металамі ўтварае сплавы і шматлікія інтэрметаліды. Атрымліваюць пераважна як пабочны прадукт пры перапрацоўцы свінцовых, цынкавых і медных руд. Выкарыстоўваюць у асн. для вырабу фота- і кінаматэрыялаў (30—40% усяго С., якое вырабляецца), сярэбрана-цынкавых акумулятараў для касм. і абароннай тэхнікі, люстраў (гл. *Серабрэнне*), як каталізатар у арган. сінтэзе; сплавы для вырабу прыпояў, кантактаў, элементаў рэле і інш. у электратэхніцы і электроніцы, манет, ювелірных вырабаў, сталовага і хім. посуду, пламбіравання і пратэзавання ў стаматалогіі; калоідны раствор С. як бактэрыцыдны прэпарат (каларгол, пратаргол).

Літ.: Малышев В.М., Румянцев Д.В. Серебро. 2 изд. М., 1987.

Я.Г. Міляшкевіч.

СЕРАБРО́ САМАРО́ДНАЕ, мінерал класа самародных элементаў, Ag. Колькасць *серабра* ў С.с. 99%. Мае прымесі вісмуту, медзі, жалеза, цынку, мыш'яку. Крышталізуецца ў кубічнай сінганіі. Утварае выгнутыя і скручаныя воласападобныя, дротавыя (да 10 см), пласціністы, шкілетныя і дэндрытавыя выдзяленні, тонкія ўкрапванні ў сульфідах. Колер серабрыста-белы. Бляск моцны металічны. Цв. 2—2,5. Шчыльн. 10,5 г/см^3. Вельмі коўкі. Праваднік цяпла і электрычнасці. Паходжанне гідратэрмальнае і гіпергеннае. Трапляецца ў поліметалічных і сульфідных радовішчах. Гал. кампанент *сярэбраных руд*.

СЕРАБРО́Ў Аляксандр Аляксандравіч (н. 15.2.1944, Масква), савецкі касманаўт. Герой Сав. Саюза (1982). Лётчык-касманаўт СССР (1982). Канд. тэхн. н. (1974). Скончыў Маскоўскі фіз.-тэхн. ін-т (1967). З 1976 у ракетна-касм. карпарацыі «Энергія» імя С.П.Каралёва, адначасова ў 1978—95 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю.А.Гагарына. 19—27.8.1982 з Л.І.*Паповым* і С.Я.*Савіцкай* здзейсніў (як бортінжынер) палёт на касм. караблі (КК) «Саюз Т-7» і арбітальнай станцыі (АС) «Салют-7» (вярнуўся на Зямлю на КК «Саюз Т-5»); 20—22.4.1983 (як касманаўт-даследчык) з У.Г.*Цітовым* і Г.М.*Стракалавым* — на КК «Саюз Т-8»; 6.9.1989—19.2.1990 (як бортінжынер) з А.С.*Віктарэнкам* — на КК «Саюз ТМ-8» і АС «*Мір*»; 1.7.1993—14.1.1994 (як бортінжынер) з В.В.*Цыбліевым* і Ж.-П.Эньерэ (Францыя) — на КК «Саюз ТМ-17» і АС «Мір». Правёў у космасе 372,95 сут. Здзейсніў 10 выхадаў у адкрыты космас.

У.С.Ларыёнаў.

СЕРАБРО́ЎСКІ Аляксандр Сяргеевіч (18.2.1892, г. Курск, Расія — 26.6.1948), рускі біёлаг, адзін з заснавальнікаў генетыкі ў СССР. Чл.-кар. АН СССР (1933), акад. УАСГНІЛ (1935). Скончыў Маскоўскі ун-т (1914). У 1929 заснаваў і ўзначаліў лабараторыю генетыкі ў Біял. ін-це імя К.А.Ціміразева, у 1931 — сектар генетыкі і селекцыі ва Усесаюзным ін-це жывёлагадоўлі УАСГНІЛ. Арганізатар і з 1930 заг. кафедры генетыкі Маскоўскага ун-та. Навук. працы па генетыцы, селекцыі, гібрыдызацыі с.-г. жывёл і раслін. Прапанаваў і эксперым. пацвердзіў схему будовы гена, выказаў ідэю пра яго дыскрэтнасць, сфармуляваў тэорыю паходжання новых генаў шляхам дуплікацыі. Стварыў новы кірунак эвалюц. вучэння — генагеаграфію.

А.С.Сераброўскі.

Унёс уклад у распрацоўку асноў селекцыі і гібрыдызацыі, метадаў генет. аналізу і ўвядзенне навук. распрацовак у с.-г. практыку.

СЕРАБРЫ́СТЫ ТРУС, мяса-шкуркавая парода трусоў. Выведзена ў СССР (Тульская і Палтаўская вобл.) скрыжаваннем мясц. чорных трусоў з пародай шампань. На Беларусі гадуюць аматары.

Канстытуцыя моцная. Целасклад, характэрны для жывёл мяснога кірунку (шырокія грудзі і спіна, моцныя ногі з развітой мускулатурай). Маса 4—6 кг. Поўсць густая, аднародная, цёмна- або светла-серабрыстая, галава, вушы, пярэдняя ч. цела і лапы цёмныя. Плоднасць 7—9 трусянят. Вызначаецца скараспеласцю, высокім выхадам мяса добрай якасці, каштоўным футрам.

Серабрысты трус.

СЕРАБРЫ́СТЫЯ ВО́БЛАКІ, светлыя, празрыстыя воблакі, якія часам з'яўляюцца ў верхняй частцы мезасферы на выш. 70—90 км. Паводле структуры нагадваюць лёгкія *перыстыя воблакі*. Уяўляюць сабой скопішча часцінак (ледзяныя крышталікі, вулканічны і касм. пыл) памерам 10^{-4}—10^{-5} см, якія добра рассейваюць сонечнае святло. Існуюць ад некалькіх мінут да некалькіх гадзін.

Назіраюцца ў Паўн. паўшар'і на шыротах 45—70° ад мая да жн., у Паўд. — на шыротах 40—65° у цёплы час года. Гл. таксама *Воблакі, Воблачнасць*.

СЕРАБРЭ́ННЕ, нанясенне на паверхню вырабаў слоя *серабра* для павышэння каразійнай стойкасці, эл. праводнасці, адбівальнай здольнасці, антыфрыкцыйных уласцівасцей ці ў дэкар. мэтах. Таўшчыня сярэбранага пакрыцця ад доляў мікраметра да 30 мкм. С. метал. вырабаў робіцца гальванічным спосабам (*гальванастэгія*), радзей плакіраваннем (гарачай пракаткай або прасаваннем тонкага слоя серабра); неметал. (з пластмас, керамікі, шкла і інш.) — хім. спосабам (аднаўленнем серабра з водных растворaў яго солей), кандэнсацыяй пары серабра ў вакууме, катодным распыленнем, метадам упальвання і інш.

СЕРАВАДАРО́Д, найпрасцейшае хім. злучэнне *серы* з вадародам, H_2S.

Бясколерны газ, з пахам тухлых яек, шчыльн. 1,538 кг/м³, $t_{кіп}$ -60,35 °С. Растваральнасць ў вадзе; водны раствор С. — сераводародная кіслата H_2S — слабая двухасноўная к-та, якая ўтварае солі гідрасульфіды і *сульфіды*. Сумесі С. з паветрам (4,5—45,5% С. па аб'ёме) выбухованебяспечныя. Пры награванні ў вільготным паветры С. узаемадзейнічае з большасцю металаў і іх аксідаў з утварэннем сульфідаў металаў. Моцны аднаўляльнік; моцнымі акісляльнікамі (азотная к-та, хлор) С. акісляецца да *сернай кіслаты*. С. ёсць у нафтавых і вулканічных газах, у вадзе некат. мінер. крыніц і лячэбных грязях; утвараецца пры раскладанні бялкоў. У прам-сці атрымліваюць як пабочны прадукт пры ачыстцы нафты, прыродных і прамысл. газаў. Выкарыстоўваюць пераважна для вытв-сці серы і сернай к-ты, а таксама для атрымання сульфідаў і сераарган. злучэнняў, у аналіт. хіміі. Атрутны, пашкоджвае слізістыя абалонкі, органы дыхання; ГДК у атм. паветры 0,008 мг/м³.

СЕРАВАДАРО́ДНАЯ КІСЛАТА́, гл. ў арт. *Серавадарод*.

СЕРАВУГЛЯРО́Д, вугляроду дысульфід, злучэнне *серы* з вугляродам, CS_2.

Бясколерная вадкасць з прыемным пахам, шчыльн. 1263 кг/м³ (20 °С), $t_{кіп}$ 46,24 °С. На святле часткова раскладаецца, таму жаўцее і пачынае смярдзець. Сумесь пары С. з паветрам (1,25—50% С. па аб'ёме) выбухованебяспечная (захоўваюць С. пад слоем вады). Дрэнна растваральнік; неабмежавана змешваецца з дыэтылавым эфірам, этанолам, хлараформам; добра растварае тлушчы, алеі, смолы, каўчукі, серу, фосфар, ёд. Пры награванні (t > 150 °С) раскладаецца вадой з вылучэннем *серавадароду*. У прам-сці атрымліваюць узаемадзеяннем пары серы з *метанам* (прыродным газам) пры 500—700 °С у прысутнасці сілікагелю або з драўняным вугалем пры 750—1000 °С. Выкарыстоўваюць у вытв-сці віскозы і фунгіцыдаў, для вулканізацыі каўчуку, як растваральнік, экстрагент. Атрутны, пашкоджвае нервовую і сардэчна-сасудзістую сістэмы; ГДК у атм. паветры 0,005 мг/м³.

СЕРАДА́ Валерый Сцяпанавіч (5.12.1936, в. Акрыёны Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. — 17.6.1997), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1986), праф. (1987). Скончыў Бел. ін-т інжынераў чыг. транспарту (1959). У 1978—97 заг. кафедры Бел. пед. ун-та. Навук. працы па эканам. тэорыі, праблемах развіцця нар. гаспадаркі, удасканальвання вытв. адносін, якасці прадукцыі, кіравання ў сферы адукацыі.

Тв.: Вопросы научного творчества студентов: (Методика, теория, практика). Мн., 1975 (разам з М.І.Базылевым); Научно-технический прогресс и качество промышленной продукции. Мн., 1978; Резервы развития народного хозяйства. Мн., 1986; Экономический словарь-справочник. Мн., 1989 (разам з М.А.Кушыным, І.С.Святліцкім); Эканамічная тэорыя. Ч. 1—3. Мн., 1994; Экономика для всех: вопр. и размышления. Вып. 1. Мн, 1995; Экономика и управление в сфере образования. Мн., 1999 (у сааўт.). *П.М.Бараноўскі.*

СЕРАДА́ Янка (Іван Мікітавіч; 13.5.1879, в. Задзвея Баранавіцкага р-на Мінскай вобл. — пасля 19.11.1943), дзеяч бел. нац. руху. Скончыў Варшаўскі ветэрынарны ін-т (1903). У 1905—06 у арміі, знаходзіўся на Маньчжурскім фронце. У 1907—11 працаваў ветэрынарам у Мінскай губ., адначасова выкладаў у Мар'інагорскім с.-г. вучылішчы. Быў чл. Бел. сацыяліст. грамады, з 1914 публікаваўся на с.-г. тэмы ў час. «Саха». У 1-ю сусв. вайну на фронце, вайск. ветэрынар. З 1917 уключыўся ў бел. нац.-вызв. рух. Старшыня прэзідыума *Усебеларускага з'езда 1917, Рады Беларускай Народнай Рэспублікі* (1918). У 1918 чл. ЦК *Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў*, у 1919—20 уваходзіў у Часовы Бел. нац. к-т, прэзідыум *Найвышэйшай рады Беларускай Народнай Рэспублікі*. У 1921—25 навук. супрацоўнік, заг. б-кі Інбелкульта, выкладчык Мінскага бел. пед. тэхнікума, у Наркамаце земляробства БССР. Арганізатар і дырэктар Мінскага ветэрынарна-заатэхн. тэхнікума (1923—24). У 1925—29 дацэнт Бел. с.-г. акадэміі ў Горы-Горках, адначасова ў 1927 навук. супрацоўнік Бел. НДІ сельскай і лясной гаспадаркі. З пач. 1930 жыў у Мінску. Аўтар прац па пытаннях ветэрынарыі і сельскай гаспадаркі. 4.7.1930 арыштаваны па справе т.зв. *«Саюза вызвалення Беларусі»*, 10.4.1931 асланы на 5 гадоў у Яраслаўль. 27.12.1941 паўторна асуджаны на 10 гадоў зняволення. Датэрмінова вызвалены 19.11.1943 з Краслага (Краснаярскі край). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны ў 1988 і 1989.

Ю.Р.Васілеўскі.

СЕ́РАДЗСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Województwo Sieradzkie), былая адм.-тэр. адзінка ў цэнтр. ч. Польшчы. З 1999 у складзе *Лодзінскага ваяводства*.

СЕРАДО́ВАЯ РЭ́ЧКА, рака ў Маларыцкім і Брэсцкім р-нах, левы прыток р. *Спанаўка* (бас. р. Зах. Буг). Даўж. 28 км (разам з каналам). Пл. вадазбору 115 км². Цячэ на ПдЗ Брэсцкага Палесся. Пачынаецца за 1,5 км на У ад в. Хмялёўка Маларыцкага р-на, вусце за 2 км на ПнУ ад в. Знаменка Брэсцкага р-на. Каналізавана 11,6 км рэчышча ў ніжнім і 9 км у верхнім цячэнні.

СЕ́РА-ДУ-ЭСПІ́НЬЯСУ (Serra do Espinhaço), група горных хрыбтоў у Бразіліі, на У Бразільскага пласкагор'я, па правабярэжжы р. Сан-Франсіску, паміж 15—21° паўд. ш. Уласна С.-д.-Э. наз. паўд. ч. паміж 16—20° паўд. ш. Выш. да 2107 м (г. Сол). Уяўляюць сабой выхады шчыльных метамарфічных парод, пераважна кварцытаў. На Пд радовішчы жал. (Ітабіра) і марганцавых руд, а таксама алмазаў, золата. На ўсх. схілах вільготныя лясы, на зах.—ксерафітныя хмызнякі і рэдкалессі.

СЕРАДЫЯГНО́СТЫКА (ад лац. serum сываратка + *дыягностыка*), выяўленне дыягназу інфекц. і неінфекц. захворванняў або вызначэнне антыгенных характарыстык тканак чалавека (напр., груп крыві) з дапамогай сералагічных даследаванняў. Засн. на выяўленні *антыгенаў* або *антыцел* у крыві (інш. вадкасцях) і тканках арганізма.

Для С. выкарыстоўваюць рэакцыі аглюцінацыі (злепанне і выпадзенне ў асадак бактэрый, клетак крыві, тканак і інш.), нейтралізацыі, прэцыпітацыі (асаджэнне комплексу антыген-антыцела ў выніку злучэння раствaральнага антыгена с антыцелам), радыеімуналагічныя, імунаферментныя і інш. метады. *І.М.Семянена.*

СЕРАКАРАТНЯ́НКА, рака ў Сенненскім р-не Віцебскай вобл., левы прыток р. Лучоса (бас. р. Зах. Дзвіна). Даўж. 24 км. Пл. вадазбору 356 км². Выцякае з Дзевінскага воз. (у некат. даведніках за пач. ракі прымаюцца сутокі рэк Добрынка і Зерамнянка за 1 км на У ад в. Добрына, дзе яна вядома пад назвай Серакаротня), цячэ праз воз. Серакаротня. Вусце за 500 м на ПнУ ад в. Шылы.

СЕРАКАРО́ТНЯ, возера ў Сенненскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Лучоса, за 34 км на У ад г. Сянно. Пл. 1,75 км², даўж. 5,2 км, найб. шыр. 650 м, найб. глыб. 5,8 м, даўж. берагавой лініі 12,3 км. Пл. вадазбору 194 км². Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы выш. 10—15 м (на З да 20 м), на У і ПдУ выш. 4—5 м, пад хмызняком, часткова разараныя. Тэраса выш. 1,5 м. Берагі на Пн зліваюцца са схіламі, на Пд і З нізкія, на У участкамі сплавінныя. Мелкаводдзе пясчанае, астатняя ч. дна ілістая. Паласа надводнай расліннасці шыр. да 30 м, месцамі адсутнічае. Моцна зарастаюць зах. і ўсх. ч. возера. Расце ахоўны від флоры Беларусі — наяда марская. Праз С. цячэ р. Серакаратнянка.

СЕРАКО́Ў Іван Сцяпанавіч (н. 23.8.1946, в. Язычкава Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне заатэхніі. Д-р с.-г. н. (1998), праф. (1999). Скончыў БСГА (1971), з 1973 працуе ў ёй (у 1993—98 заг. кафедры). Навук. працы па выкарыстанні вітамінаў і інш. біялагічна-актыўных рэчываў у кармавых дабаўках у рацыёнах с.-г. жывёл.

Тв.: Теоретические и практические аспекты использования витаминов U, B_{12} и коэнзима B_{12} в рационах свиней. Горки, 1999; Племенная работа в пчеловодстве с основами биометрии. Мн., 1999.

СЕРАКО́ЎСКІ (Sierakowski) Зыгмунт (Сігізмунд; псеўд. Даленга; 30.5.1826, с. Лісавое Маневіцкага р-на Валынскай вобл., Украіна — 27.6.1863), адзін з кіраўнікоў *паўстання 1863—64* у Польшчы, Літве і Беларусі. Вучыўся ў Пецярбургскім ун-це (1845—48), скончыў Акадэмію Генштаба ў Пецярбургу (1859). У 1848 за ўдзел у студэнцкіх хуртках высланы радавым у Арэнбургскі корпус, дзе пасябраваў з Т.Р.Шаўчэнкам, Б.Залескім. У 1856 вярнуўся ў Пецярбург, падтрымліваў сувязі з М.А.Дабралюбавым, М.Г.Чарнышэўскім, супрацоўнічаў у час. «Современник». Арганізатар і кіраўнік ваен.-рэв. арг-цыі ў Пецярбургу, членамі якой былі браты В. і К.Каліноўскія. Чл. арг-цыі выступалі супраць сац., нац і рэліг. прыгнёту, за бурж.-дэмакр. пераўтварэнні ў Расіі, за свабодную і незалежную Рэч Паспалітую, узаемадзейнічалі з польскімі канспіратарамі з партыі «чырвоных», з «Зямлёй і воляй», К-там рускіх афіцэраў у Польшчы. У час замежных паездак (1860—61, 1862) сустракаўся і зблізіўся з А.І.Герцэнам, М.П.Агаровым, Дж.Гарыбальдзі, наладзіў канспіратыўныя сувязі з польскай рэв. эміграцыяй. Да пач. паўстання працаваў у Генштабе. У снеж. 1862 прызначаны ваен. нач. паўстання ў Літве. Вясной 1863 на Ковеншчыне арганізаваў паўстанцкае злучэнне (2 тыс. чал.). Прыхільнік цеснай сувязі польскага паўстання з агульнарус. рухам. Імкнуўся аб'яднаць рух літ. сялян на чале з А.Мацкявічусам з бел. паўстанцкімі атрадамі К.Каліноўскага. 7—9.5.1863 паўстанцы С. разбіты пад мяст. Біржы, паранены С. ўзяты ў палон. Павешаны на Лукішскай плошчы ў Вільні.

Тв.: Записка З.Сераковского «Вопрос польский» // Русско-польские революционные связи. М., 1963. Т. 1.

Літ.: Дьяков В.А. Сигизмунд Сераковский. М., 1959; Смирнов А.Ф. Сигизмунд Сераковский. М., 1959. *Г.В.Кісялёў.*

СЕРАКО́ЎСКІ Юзаф (каля 1750—1817), адзін з кіраўнікоў *паўстання 1794* у Польшчы, на Беларусі і ў Літве, генерал. Вучыўся ў Варшаве ў корпусе кадэтаў. Быў вядомы як здольны вайсковы інжынер і артылерыст. У ліп.—жн. 1794 на чале 4-тысячнага корпуса прайшоў рэйдам ад мяст. Высокае (праз Шарашова, Пружаны, Ружаны) да Слоніма. Удзельнік *Крупчыцкага бою 1794* і бою пад Брэстам.

СЕРАЛО́ГІЯ (ад лац. serum сываратка + ...*логія*), раздзел *імуналогіі*, які вывучае механізмы сералагічных рэакцый, магчымасці іх выкарыстання ў біялогіі і медыцыне. Сералагічныя рэакцыі пашыраны для дыягностыкі захворванняў, вызначэння антыгенных уласцівасцей біял. тканак (груп крыві, ступені чужароднасці органаў, што перасаджваюцца), гармонаў, лек. сродкаў, вывучэння механізмаў працэсаў жыццядзейнасці і іх парушэнняў. Гл. таксама *Серадыягностыка*.

Літ.: Никитин В.М. Справочник серологических реакций. Кишинев, 1977; Иммунологические методы. М., 1987; Руководство по инфекционным болезням. СПб., 2000. *І.М.Семяненя.*

СЕРА́М, востраў на У Малайскага архіпелага, у складзе Малукскіх а-воў. Тэр. Інданезіі. 17,1 тыс. км^2 (з прылеглымі астравамі 18,7 тыс. км^2). Гарысты, выш. да 3019 м (г. Біная). На вузкай паласе ўзбярэжжа нізіны. Каля берагоў месцамі каралавыя рыфы. Клімат экватарыяльны, вільготны. Т-ра паветра на працягу года 25—27 °С, ападкаў на раўнінах да 2000 мм, у гарах да 4000 мм за год. Густыя вільготныя трапічныя лясы, на Пд участкі мусонных лясоў. На прыбярэжных раўнінах вырошчваюць какосавую пальму, тытунь, каўчуканосы. Трапічнае земляробства, рыбалоўства. На паўн. беразе порт Вахай.

СЕРАНЧА́НЫ, другая назва воз. *Саранчаны*.

СЕРАПІЁН УЛАДЗІ́МІРСКІ (?—1275), старажытнарускі пісьменнік-прапаведнік. Архімандрыт Кіева-Пячэрскага манастыра, з 1274 епіскап Уладзімірскі. З яго «слоў» (пропаведзі, павучанні) дайшло 5 у зб-ках «Залатая чэпь» (14 ст.), «Паісіеўскі» (14 — пач. 15 ст.), «Ізмарагд», «Златавуст». Гал. тэма — пакуты рус. народа ў сувязі з мангола-татарскім нашэсцем. Славіў ратныя подзвігі абаронцаў роднай зямлі, выказваў надзею на вызваленне Русі і дакараў князёў, якія сваімі нязгодамі наклікалі на яе бяду як боскую кару за іх грахі, асуджаў сац. несправядлівасць, выкрываў забабоны, заклікаў да маральнага ўдасканалення. Ім уласцівы актуальнасць зместу, вобразнасць, паэтычнасць, эмацыянальнасць, дынамічнасць, рытмічнасць. Апрача царк. кніжнасці апіраўся на *апокрыфы* і нар. легенды, развіваў лепшыя традыцыі аратарскай прозы Іларыёна і Кірылы Тураўскага.

Літ.: Памятники литературы Древней Руси, XIII в. М., 1981. *Л.Л.Кароткая.*

«СЕРАПІЁНАВЫ БРАТЫ́» (па назве гуртка сяброў у аднайм. рамане Э.Т.А.*Гофмана*), літаратурная група ў Петраградзе ў 1921—29. Узнікла пры арг-цыі работнікаў мастацтваў «Дом мастацтваў». Уваходзілі — І.Груздзеў, М.Зошчанка, У.Іванаў, В.Каверын, Л.Лунц, М.Нікіцін, Л.Палонская, М.Слонімскі, М.Ціханаў, К.Федзін. У «Партызанскіх аповесцях» Іванава, рамантычных балладах Ціханава, сатыр. апавяданнях Зошчанкі, рамане Федзіна «Гарады і гады» і інш. іх творах самабытна і рознабакова адлюстравана рэв. эпоха. Адзіны сумесны зб. — «Серапіёнавы браты» (1922). Падкрэслівалі сваю апалітычнасць. Шмат увагі аддавалі засваенню тэхналогіі мастацтва ў дыяпазоне ад рус. псіхал. рамана да вострасюжэтнай прозы Захаду. За імкненне да эксперыменту «С.б.» часам абвінавачвалі ў фармалізме.

Літ.: Горький М. Группа «Серапионовы братья» // Литературное наследство. М., 1963. Т. 70; Каверин В. Освещенные окна. М., 1978. С. 406—544.

СЕРА́ПІС, Сарапіс, божышча, культ якога быў уведзены ў эліністычным Егіпце царом Пталамеем I [305—283 да н.э.]. Егіпцяне атаясамлівалі С. з богам урадлівасці *Асірысам*, часам са свяшчэнным быком *Апісам*. Як і Асірыс, ён лічыўся ўладаром мёртвых, падаўцом урадлівасці і богам-лекарам. Грэкі атаясамлівалі яго з *Зеўсам*. Культ С. быў пашыраны, акрамя Егіпта, ва ўсім эліністычным свеце.

СЕРАПРАФІЛА́КТЫКА (ад лац. serum сываратка + *прафілактыка*), увядзенне ў арганізм антыцел супраць мікраарганізмаў або іх таксінаў для прафілактыкі інфекц. хвароб. Пры С. ўводзяць *імуналабуліны*, імунныя сываратки, у выніку ўзнікае пасіўны імунітэт (да 2—4 тыдняў). Ужываюць пры высокай рызыцы заражэння з мэтай прадухілення батулізму, слупняку, дыфтэрыі, сібірскай язвы і інш. Эфектыўнасць С. тым большая, чым раней яна праведзена. Калі пасля С. чалавек захварэў, хвароба працякае менш цяжка, радзей узнікаюць ускладненні і інш. *І.М.Семяненя.*

СЕ́РАС-КАЛАРА́ДАС (Cerros Colorados), вадасховішча на ПдЗ Аргенціны. Створана на р. Неўкен у 1969—71. Пл. 607 км^2, аб'ём вады 43,4 км^3, даўж. 55 км. Выкарыстоўваецца для энергет. мэт і ірыгацыі.

СЕРАСКЕ́Р (тур. sarasker), у Асманскай імперыі першапачаткова галоўнакамандуючы арміяй, якога выбіралі з ліку пашоў; у канцы 19 — пач. 20 ст. — ваен. міністр. Акрамя таго, з канца 16 ст., калі тур. султаны ўхіліліся ад асабістага камандавання войскамі, тытул С. насілі нам. вял. *везіра*, якія кіравалі войскамі. Тытул С. скасаваны ў пач. 20 ст.

СЕРАТАНІ́Н (ад лац. serum сываратка + грэч. tonos напружанне), біялагічна актыўнае рэчыва, адзін з *медыятараў* нерв. сістэмы. Удзельнічае ў перадачы нерв. імпульсаў, садзейнічае надыходу сну, прыгнечвае болевую адчувальнасць, зніжае т-ру цела, выклікае скарачэнне гладкіх мышцаў, павялічвае згусальнасць крыві, валодае радыеахоўнымі ўласцівасцямі і інш. Прысутнічае ў тканках большасці жывёл і раслін (шмат у бананах, ананасах).

У млекакормячых і чалавека да 90% С. ўтрымліваецца ў кішэчніку, ёсць таксама ў трамбацытах, гіпаталамусе, эпіфізе. Недахоп С. ў мозгу адзначаецца пры дэпрэсіях, эпілепсіі і інш., лішак прыводзіць да спазмы бронхаў, болю ў жываце. У медыцыне выкарыстоўваюць як кроваспыняльны сродак.

І.М.Семяненя.

СЕРАТЭРАПІ́Я (ад лац. serum сываратка + *тэрапія*), метад лячэння шляхам увядзення імунных сываратак або *імуналабулінаў*. Распрацаваў Э.А.*Берынг*.

Выкарыстоўваюць пры дыфтэрыі, слупняку, інш. хваробах, таксама пры імунадэфіцытных станах, з мэтай прыгне-

чання імунітэту ў трансплантаогіі і інш. Пры С. бываюць ускладненні — алергічныя рэакцыі (амаль да анафілактычнага шоку, гл. *Анафілаксія*).

СЕРАФІМО́ВІЧ (сапр. П а п о ў) Аляксандр Серафімавіч (19.1.1863, станіца Ніжнекурмаярская Цымлянскага р-на Растоўскай вобл., Расія — 19.1.1949), рускі пісьменнік. Вучыўся ў Пецярбургскім ун-це (1883—87). За рэв. дзейнасць сасланы ў Архангельскую губ. (1897—90). У 1926—29 рэдагаваў час. «Октябрь». Адзін з арганізатараў Саюза пісьменнікаў СССР. Друкаваўся з 1899. Першая кніга — «Апавяданні і нарысы» (1901). У ранніх творах раскрываў драматызм штодзённай барацьбы чалавека за выжыванне. У аповесці «Пяскі» (1908), рамане «Горад у стэпе» (1912) — маральная праблематыка, звязаная з развіццём капіталізму ў горадзе. Раман «Жалезны паток» (1924), у аснове якога гіст. факт — паход Таманскай арміі (1918), лічыўся класікай сацыялістычнага рэалізму. Аўтар нарысаў пра калектывізацыю (серыя «Па данскіх стэпах», 1931), грамадз. і Вял. Айч. войны, артыкулаў пра л-ру. С. наведваў Беларусь, быў асабіста знаёмы з Я.Купалам, Я.Коласам, Ц.Гартным, П.Галавачом, М.Лыньковым і інш., удзельнічаў у рабоце 2-га пленума праўлення БелАПП (1931). На бел. мову яго творы перакладалі С.Іва, П.Місько, С.Хурсік і інш. Дзярж. прэмія СССР 1943.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—7. М., 1959—60; Бел. пер. — Вераб'іная ноч: Апавяданні. Мн., 1930; Горад у стэпу. Мн., 1930; Жывы астрог: Апавяданні. Мн., 1930; Сопка з крыжамі: Апавяданні. Мн., 1930; У нумары. Мн., 1930; У сям'і: Апавяданне. Мн., 1930; Працавітыя юнакі: Апавяданні. Мн., 1931; Стачка. Мн., 1932; Жалезны паток. 3 выд. Мн., 1936; Апавяданні. Мн., 1937 (на вокл.: 1938).

Літ.: В о л к о в А.А. Творческий путь А.С. Серафимовича. 2 изд. М., 1963; Х и г е р о в и ч Р.И. Путь писателя: Повесть о Серафимовиче. 3 изд. М., 1963; Воспоминания современников об А.С.Серафимовиче. М., 1977; Ч а л м а е в В.А. Серафимович. Неверов. М., 1982.

СЕРБАЛУ́ЖЫЦКІЯ МО́ВЫ, блізкія паміж сабою верхнялужыцкая і ніжнялужыцкая мовы сербаў-лужычан. Належаць да паўн. падгрупы зах. групы *славянскіх моў*. Распаўсюджаны ў Германіі вакол гарадоў Баўцэн (па-сербалужыцку Будышын) і Котбус (па-сербалужыцку Хосебуз). Больш пашырана верхнялужыцкая мова. С.м. уласцівы: у фанетыцы — націск фіксаваны на 1-м складзе, пратэтычны гук w перад u, o, змякчэнне шэрагу зычных; у марфалогіі — парны лік, клічны склон у назоўніках м.р. адз.л., архаічныя дзеяслоўныя формы (аорыст, імперфект, плюсквамперфект), адсутнасць кароткіх прыметнікаў; у лексіцы — шмат калек, запазычанняў з ням. мовы, словы чэш. і польскага паходжання. Асн. адрозненні верхнялужыцкай і ніжнялужыцкай моў: адпаведнасць верхнялужыцкага праточнага h ніжнялужыцкаму выбухному g, верхнялужыцкага ć ніжнялужыцкаму c (цоканне); на месцы палатальных t, d у верхнялужыцкай ć, dź, у ніжнялужыцкай ś, ź і інш.

Пісьменства і друкаваныя кнігі з 16 ст. Сфарміраваліся 2 літ. мовы: верхнялужыцкая (мова паўд. Лужыцы, якая ўваходзіла ў склад Саксоніі, цэнтр г. Будышын) і ніжнялужыцкая (мова паўн. Лужыцы, якая ўваходзіла ў склад Прусіі, цэнтр г. Хосебуз). Усе сербалужычане двухмоўныя: разам з С.м. карыстаюцца ням. мовай. Алфавіт на аснове лацінкі.

Літ.: Е р м а к о в а М.И. Очерк грамматики верхнелужицкого литературного языка: Морфология. М., 1973; Т р о ф и м о в и ч К.К. Серболужицкий язык. Мн., 1989.

Н.В.Іваўшына.

СЕРБАНТО́ВІЧ Анатоль Станіслававіч (13.5.1941, в. Ордаць Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл. — 21.3.1970), бел. паэт. Скончыў БДУ (1965). Працаваў у газ. «Піянер Беларусі» і час. «Бярозка». Друкаваўся з 1959. Аўтар зб-каў паэзіі «Азбука» (1966), «Міннае поле» (1968), «Пярсцёнак» (1971), у якіх змешчаны вянкі санетаў «Васілёк», «Курганы», «Салдат», балады, лірычныя вершы пра маладосць, харaство жыцця, каханне.

СЕ́РБАЎ Ісак Абрамавіч (27.5.1871, в. Кульшычы Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл. — 21.1.1943), бел. этнограф, фальклярыст, археолаг. Правадз. чл. Інбелкульта (1922). Канд. гіст. н. (1934). Скончыў Полацкую настаўніцкую семінарыю (1892), Маскоўскі археал. ін-т (1918). Працаваў настаўнікам у Мінску, Гомелі, Вільні, Троках, Хоцімску, Стоўбцах. У 1910—12 як член Паўн.-Зах. аддзела Рус. геагр. т-ва наладзіў шэраг экспедыцый па Беларусі. У 1917—18 заг. аддзела нар. асветы ў г. Сальцы Наўгародскай губ., з 1919 у аддзелах нар. асветы Магілёўскай і Гомельскай губ. З 1923 выкладчык, заг. кафедры этнаграфіі БДУ, супрацоўнік секцыі этнаграфіі Ін-та гісторыі АН БССР. У Вял. Айч. вайну выкладчык Тамбоўскага пед. ін-та. З 1900 вывучаў побыт, матэрыяльную культуру, вусную паэт. і муз. творчасць бел. народа. Сабраў багатыя калекцыі нар. адзення і мастацтва, на аснове якіх выдадзены альбом «Беларускае народнае мастацтва» (1951). Першы з бел. этнографаў стварыў вял. фотатэку (каля 5 тыс. фотаздымкаў), у якой зафіксаваны тыпы адзення жыхароў розных куткоў Палесся, жылля, гасп. пабудоў, вырабы рамёстваў і інш. Сабраныя этнагр. матэрыялы і назіранні абагульнены ў працах «Сяло Вялікае: Малюнкі з жыцця Беларусі» (1910), «Паездкі па Палессі 1911 і 1912 гг.» (1914), «Беларусы-сакуны» (1915). У 2-й пал. 1920-х г. правёў раскопкі грунтавога могільніка 5—8 ст. каля Новага Быхава, даследаваў курганы дрыгавічоў (каля Мінска і Мазыра), радзімічаў (каля Новага Быхава, у басейнах рэк Проня і Ухлясць), крывічоў (па р. Ушача). Вывучыў каля 100 насыпаў, абследаваў і апісаў больш за 30 гарадзішчаў, селішчаў і стаянак.

Тв.: Археалагічныя раскопкі ў аколіцах Менску ў 1925 г. Мн., 1927; Вічынскія паляне. Мн., 1928; Археалагічныя помнікі Ушацкага раёна Полацкай акругі // Зап. аддз. гуманіт. навук БАН. Мн., 1930. Кн. 11. Пр. археал. камісіі, т. 2; Археалагічныя абследаванні ў вадазборах рэк Проні — Ухлясці ў был. Магілёўшчыне // Працы секцыі археалогіі Ін-та гісторыі БАН. Мн., 1932. Т. 3.

Літ.: Б а н д а р ч ы к В.К. Гісторыя беларускай этнаграфіі. Пачатак XX ст. Мн., 1970; Я г о ж. Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі. Мн., 1972; Ц і ш ч а н к а І.К. З творчай спадчыны І.А. Сербава // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1974. №1.

В.С.Вяргей.

І.А.Сербаў.

В.Ф.Сербін.

СЕ́РБА-ХАРВА́ТА-СЛАВЕ́НСКАЕ КАРАЛЕ́ЎСТВА, адна з назваў дзяржавы *Югаславія* ў 1918—29.

СЕРБАХАРВА́ЦКАЯ МО́ВА, гл. ў арт. *Сербская мова, Харвацкая мова.*

СЕРБЕДА́РЫ, с а р б а д а р ы (перс. — шыбенікі), удзельнікі нар. руху ў Цэнтр. Азіі і Усх. Іране ў 14 ст. Заснавальнік руху С. — шэйх Халіфэ, які выступіў у г. Харасан з пропаведдзю *шыізму* супраць правіцеляў-суніцаў. Пасля забойства ў 1335 Халіфэ яго справу працягваў шэйх Хасан Джуры. Ён заснаваў асобнае рэліг. брацтва (тарыкат), падтрыманае насельніцтвам Харасана. У выніку нар. паўстання ў Харасане С. захапілі г. Себзевар, які зрабілі сваёй сталіцай (1337), потым — Нішапур і Тус. Галава С. — Веджых ад-дзін Масуд абвясціў сябе султанам. У 1353 С. разбілі войска апошняга правіцеля *Хулагуідаў дзяржавы* Туга Цімура. З часам дзяржава С. ператварылася ў звычайную феад. дзяржаву, якая была знішчана войскамі *Цімура* ў 1381. Паўстанні С. адбыліся таксама ў Самаркандзе (1365), Кермане (1373—74) і Себзевары (1383).

СЕРБЕ́НТА Віталь Андрэевіч (14.6.1895, в. Люкяй Марыямпальскага пав., Літва — 26.10.1980), бел. гісторык і філосаф. Акад. АН Беларусі (1931), праф. (1930), д-р гіст. н. (1934). Скончыў гіст.-філал. (1920) і мед. (1922) ф-ты Харкаўскага ун-та, Ін-т чырв. прафесуры(1924). Удзельнік рэв. руху, рэдактар падп. і легальных выданняў у Літве, Маскве, Варонежы, Харкаве. З 1917 чл. Харкаўскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. З 1920 заг. аддзела друку Харкаўскага губкома КП(б)У, сакратар ЦБ Літоўскіх секцый пры ЦК КП(б)У; рэдактар літ. газ. «Darbininkų balsas» («Голас рабочага»), час. «Raudonóju

Dirva» («Чырвоная ніва»), газ. «Красные резервы», «Красноармейская страніца», «Коммунист» [орган ЦК КП(б)У]. У 1922—23 выкладаў у Камуніст. ун-це нац. меншасцей Захаду імя Ю.Мархлеўскага (Масква). У 1924—25 заг. Віцебскай губсаўпартшколы. У 1924—34 дацэнт, потым праф. БДУ і Камуніст. ун-та. У 1925—27 нам. заг. аддзела друку ЦК КП(б)Б. У 1929—32 дырэктар Ін-та гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б. У 1931—37 чл. Прэзідыума, у 1932—37 заг. сектара Ін-та гісторыі АН Беларусі. Абвінавачаны ў патуранні антыпартыйным групам у бел. гіст. навуцы, 22.5.1937 арыштаваны і асуджаны на 10 гадоў. У 1956 рэабілітаваны. З 1957 заг. сектара, з 1967 ст. навук. супрацоўнік Ін-та філасофіі і права АН Беларусі. Працы па філасофіі і сац. думцы на Беларусі і Літве. Адзін з рэдактараў перакладу збораў твораў У.І.Леніна ў 12 т. на бел. мову (1925—33). Сааўтар кніг «З гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі» (1962), «Нарысы гісторыі марксісцка-ленінскай філасофіі ў Беларусі, 1919—1968» (1968).

В.А.Астрога.

СЕ́РБІН Васіль Феадосьевіч (н. 24.2.1918, г. Харкаў, Украіна), бел. і рас. дырыжор, хормайстар. Засл. арт. Беларусі (1954). Засл. дз. маст. Беларусі (1961). Нар. арт. Расіі (1970). Вучыўся ў Харкаўскай кансерваторыі (1937—41). З 1945 маст. кіраўнік і гал. дырыжор ансамбляў песні і танца Уральскай ваен. акругі, Паўд. групы войск, Бел. ваен. акругі, Групы сав. войск у ГДР. З 1973 маст. кіраўнік, з 1983 дырыжор бюро спец. мерапрыемстваў Бел. філармоніі. Аўтар песень «Да спаткання, сталіца», «Марш мінскіх суворавцаў», «У Беларусі мы служым» і інш. на вершы бел. паэтаў А.Астрэйкі, А.Бачылы, П.Броўкі, М.Танка, П.Харкова, М.Ясеня, апрацовак бел. і рус. нар. песень для мужч. хору. Дзярж. прэміі мастацтваў ГДР 1968, 1972.

А.Я.Ракава.

СЕ́РБІН Нектарый, мастак 16 ст. Паходзіў з Сербіі. У 1557 у *Супрасльскай царкве-крэпасці* выканаў размалёўкі «Хрыстос уседзяржыцель» у гал. купале і сцэн на евангельскія сюжэты на сценах храма.

СЕ́РБІЯ (Србија), Рэспубліка Сербія (Республика Србија), рэспубліка ў складзе Саюзнай Рэспублікі *Югаславіі*. Займае большую ч. краіны (88,4 тыс. км² са 102 тыс. км²) і канцэнтруе большую ч. насельніцтва (каля 10 млн. чал. з 10,7 млн. чал. у краіне, 2000). Сталіца — г. *Бялград*. У адм. адносінах падзяляецца на акругі і абшчыны. Сербы складаюць каля 70%, албанцы — каля 17% (пераважна ў б. аўт. краі Косава), венгры — каля 4% (пераважна ў б. аўт. краі Ваяводзіна) насельніцтва. Жывуць таксама румыны, харваты, чарнагорцы, цыганы і інш. Паўн. ч. знаходзіцца на паўд. ускраіне *Сярэднедунайскай раўніны*, у цэнтры і на Пд — Сербскае нагор'е, Усх.-Сербскія горы, частка *Дынарскага нагор'я*, катлавіны Косава Поле і Метохія. Найвыш. пункт (2764 м) на мяжы з Албаніяй, у хр. Карабі. Клімат умераны, кантынентальны. Ападкаў 500—800 мм за год, у гарах да 1000 мм. З карысных выкапняў ёсць медныя і свінцова-цынкавыя руды, каменны і буры вугаль, нафта і прыродны газ. Лясы, пераважна букавыя (займаюць каля 27% тэр.), захаваліся ў гарах. У гаспадарцы роля прам-сці і сельскай гаспадаркі прыкладна аднолькавая. У прам-сці найб. развітыя энергетычныя, горназдабыўная, металург. і маш.-буд. галіны. Энергетыка базіруецца на выкарыстанні бурага і каменнага вугалю. ГЭС Джэрдап на Дунаі (сумесная з Румыніяй), значныя ГЭС на рэках Дрына, Уласіна, Лім і інш. Вылучаюцца здабыча, выплаўка і пракат медзі і сурмы, здабыча свінцу і цынку. Чорная металургія прадстаўлена камбінатам у г. Смедарава. У хім. прам-сці значная вытв-сць сернай кіслаты і мінер. угнаенняў, выпуск штучных валокнаў і нафтахім. прадукцыі. Шматгаліновае машынабудаванне: электратэхніка і электроніка, вытв-сць с.-г. машын, горнага абсталявання, грузавых і легкавых аўтамабіляў і інш. Развіты тэкст., гарбарна-абутковая, харч. і інш. галіны прам-сці. Гал. прамысл. цэнтры: Бялград, Нові-Сад, Ніш, Субаціца, Крагуевац, Прышціна. Сельская гаспадарка збожжава-жывёлагадоўчага кірунку. Вырошчваюць кукурузу, пшаніцу, жыта, цукр. буракі, каноплі, сланечнік, бульбу, гародніну. Садоўніцтва (найб. слівы) і вінаградарства. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней і авечак. Птушкагадоўля. Збожжавая гаспадарка найб. развіта ў раўнінных раёнах на Пн, жывёлагадоўля — у цэнтр. і паўд. горных раёнах. Транспарт. чыг. і аўтамабільны. Суднаходства па Дунаі і Саве.

1.12.1918 С. разам з інш. паўднёваслав. землямі ўтварыла адзіную дзяржаву — Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 Югаславія) на чале з дынастыяй Карагеоргіевічаў. Пасля скасавання манархіі ў 1945 С. (у сучасных межах) — Нар. рэспубліка ў складзе Федэратыўнай Нар. Рэспублікі Югаславіі, з 1963 — адна з сацыяліст. рэспублік у складзе Сацыяліст. Федэратыўнай Рэспублікі Югаславіі (СФРЮ). Па-за межамі С., у рэспубліках Боснія і Герцагавіна, Харватыя засталася значная колькасць сербаў. Пасля распаду СФРЮ (1991) С. (з 1991 сучасная наз-

Гісторыя. На тэр. сучаснай С. здаўна жылі ілірыйскія і фракійскія плямёны, моцна раманізаваныя ў выніку заваявання Стараж. Рымам (229 да н.э. — 106 н.э.). З 395 н.э. большая ч. гэтых зямель у складзе *Візантыі*. У 4—6 ст. на тэр. С. нападалі *вестготы, гуны, авары*. У 7 ст. сюды прыйшлі слав. плямёны, якія падпарадкавалі і асімілявалі мясц.насельніцтва. З 8 ст. пачала фарміравацца сербская народнасць і складваліся феад. адносіны. У 9 ст. сербы прынялі хрысціянства. У сярэдзіне 10 ст. ўзнікла Сербскае княства. У пач. 11 ст. С. падпарадкавана Візантыяй. У 2-й пал. 12 ст. тут узмацнілася княства Рашка, дзе вял. жупанам (князем) у 1168—96 быў Стэфан Нэманя (Няманя) — заснавальнік дынастыі *Няманічаў*. Пры ім вакол Рашкі склалася адзіная сербская феад. дзяржава (з 1217 каралеўства, з 1345—46 царства), дасягнута незалежнасць ад Візантыі. У 1219 абвешчана аўтакефалія (фактычная незалежнасць) сербскай правасл. царквы. Кароль (з 1346 цар) Стэфан Душан [1331—55] пашырыў сваю ўладу на амаль усе сербскія, македонскія, албанскія і ч. грэч. зямель. У 2-й пал. 14 ст. царства Няманічаў распалася. У выніку паражэння на *Косавым Полі* (1389) С. трапіла ў васальную залежнасць ад туркаў, у 1459 уключана ў Румелійскі эялет Асманскай імперыі. У 16—18 ст. сербы неаднаразова (1594, 1597—98, 1688—90, 1711) паўставалі супраць тур. няволі. У выніку *сербскіх паўстанняў пачатку 19 стагоддзя* (1804—13, 1815) пачалося аднаўленне сербскай дзяржаўнасці на чале з князем і скупшчынай (парламентам). Першым князем С. стаў *Георгій Петравіч-Карагеоргій* [1808—13], наступным — *Мілаш Абрэнавіч* [1815—39, 1858—60]. У далейшым на прастоле С. змяніліся прадстаўнікі дынастый *Абрэнавічаў* [1815—42, 1858—1903] і *Карагеоргіевічаў* [1842—58, 1903—18]. У 1830—33 пад дыпламат. націскам Расіі Турцыя афіцыйна дала статус аўт. княства Паўн. С. ў межах Бялградскага пашалыка. Пры кн. Міхаілу Абрэнавічу (1860—68) створана нац. армія, ліквідаваны тур. ваен. гарнізоны. У выніку *сербска-чарнагорска-турэцкіх войнаў 1876—78* і перамогі Расіі ў рус.-тур. вайне 1877—78 С. паводле рашэння *Берлінскага кангрэса 1878* атрымала незалежнасць і павялічыла сваю тэрыторыю. З 1882 С. — каралеўства. У выніку *Балканскіх войнаў 1912—13* да С. далучаны паўн. ч. гіст. *Македоніі* (сучасная Рэспубліка Македонія) і б.ч. краю *Косава* са значным алб. насельніцтвам. Рэзка абвастрыліся адносіны з Аўстра-Венгрыяй, якая, скарыстаўшы *Сараеўскае забойства*, 28.7.1914 напала на С., што стала пачаткам 1-й сусв. вайны, у якой С. ўдзельнічала на баку *Антанты*. З 1915 С. акупіравана аўстра-герм. і балг. войскамі. Вызвалена восенню 1918.

ва) і Чарнагорыя ўтварылі 27.4.1992 новую федэрацыю — Саюзную Рэспубліку Югаславію. Гісторыю пасля 1918 таксама гл. ў арт. *Югаславія*.

Літ.: История Югославии. Т. 1—2. М., 1963; Јиричек К. Историја Срба. Кн. 1—2. Београд, 1980; Историја српског народа. Кн. 1—2. Београд, 1981; Раннефеодальные государства и народности: (южные и западные славяне VI—XII вв.). М., 1991; Сербия: Вчера и сегодня. Белград, 1995; Данченко С.И. Развитие сербской государственности и России, 1878—1903. М., 1996; История южных и западных славян. Т. 1. Средние века и новое время. М., 1998. *В.А.Сімакова* (гісторыя).

«СЕРБІЯ́НКА», бел. бытавы імправізацыйны танец. Муз. памер 2/4. Тэмп ад умеранага да хуткага. Існуе ў сольным і масавым варыянтах. Танец кампазіцыйна разнастайны, уключае прытупы, прысядкі і падбіўкі, выконваецца пад шматлікія прыпеўкі, часцей гумарыст. характару. У пач. 20 ст. пашырылася па ўсёй Беларусі. *Ю.М.Чурко.*

СЕ́РБСКА-ЧАРНАГО́РСКА-ТУРЭ́ЦКІЯ ВО́ЙНЫ 1876—78, вызваленчыя войны Сербіі і Чарнагорыі супраць Асманскай імперыі. Праходзілі ва ўмовах нарастання нац.-вызв. руху на Балканах (гл. *Красавіцкае паўстанне 1876* у Балгарыі). 18.6.1876 Чарнагорыя і Сербія (патрабавала ад Асманскай імперыі перадачы Босніі і Герцагавіны пад сваё кіраванне) абвясцілі вайну Турцыі. У ходзе ваен. дзеянняў тур. войскі занялі шэраг населеных пунктаў Сербіі. Дзякуючы ультыматуму Расіі (прад'явіла тур. ўраду 31.10.1876) было заключана перамір'е. У лют. 1877 Сербія падпісала мір з Турцыяй на ўмовах даваен. становішча (Чарнагорыя мірны дагавор не падпісала). З пачаткам рус.-тур. вайны 1877—78 Чарнагорыя ў крас. 1877 аднавіла ваен. дзеянні. У снеж. 1877 Сербія зноў уступіла ў вайну, якая была фактычна часткай рус.-тур. вайны 1877—78. Сербскія і чарнагорскія войскі сумесна з рас. атрадам ген. І.У.*Гуркі* дасягнулі значных поспехаў на паўд. і ўсх. напрамках. Паводле рашэнняў *Берлінскага кангрэса 1878* Сербія і Чарнагорыя атрымалі незалежнасць і значна пашырылі свае тэрыторыі.

СЕ́РБСКАЯ МО́ВА, адна са *славянскіх моў* (паўд. група). Вядома таксама пад назвамі серб(ск)ахарвацкая (харвацка-сербская), што з'яўляецца адлюстраваннем асаблівасцей гіст. і сац.-паліт. развіцця паўд. славян у 19—20 ст.: прыняцце *сербамі* і *харватамі* на хвалі нац.-вызв. барацьбы 19 ст. агульных асноў літ. мовы на базе сербскіх штокаўскіх гаворак, а пазней — выкарыстанне ў дзяржаве Югаславія (1918—91) агульнай мовы сербаў, чарнагорцаў, харватаў і мусульманскай часткі жыхароў Босніі і Герцагавіны (нашчадкаў этн. славян, якія ў час турэцкага панавання прынялі іслам). З 1991 за харвацкім і сербскім варыянтамі заканадаўча замацаваны статус *харвацкай мовы* (Рэспубліка Харватыя) і С.м. (Саюзная Рэспубліка Югаславія). Ужываецца ў Венгрыі, Румыніі, Германіі, Швецыі, ЗША, Канадзе, Аўстраліі і інш.

У аснове С.м. — штокаўскі дыялект з трыма асн. тыпамі гаворак (екаўскі/іекаўскі, экаўскі і ікаўскі). С.м. ўласцівы: у фанетыцы — наяўнасць доўгіх і кароткіх галосных, адсутнасць рэдукцыі ненаціскных галосных, у пэўных пазіцыях гук р словаўтваральны, з 25 зычных 5 мяккія (љ, њ больш мяккія, чым бел. [ль], [нь]), [х] менш актыўны, чым бел. [х] (у многіх гаворках страчаны ці замяняецца санорнымі [в] і [j]), націск політанічны ці музычны (4 тыпы); у марфалогіі — 3 асн. тыпы скланення назоўнікаў, клічны склон у адз.л., марфал. выражэнне катэгорыі адушаўлёнасці толькі ў назоўніках адз.л. м.р., адсутнасць скланення ў колькасных лічэбніках пасля 5, складаная сістэма спрагальных і неспрагальных форм дзеяслова, займеннікавыя і дзеяслоўныя энклітыкі, суіснаванне інфінітыва і канструкцыі «да + форма цяперашняга часу», якая яго змяняе; у сінтаксісе — свабодны парадак слоў у сказе, рэгламентуецца толькі месца і паслядоўнасць ужывання энклітык.

Першыя пісьмовыя помнікі: кірылічныя Міраслававa і Вуканава евангеллі (канец 12 — пач. 13 ст.), Грамата бана (баснійскага правіцеля) Куліна 1198. Развіццё пісьменства і літ. мовы затармазілася нашэсцем туркаў (канец 14 ст.) і шматвяковым турэцкім прыгнётам. Пісьмовая традыцыя развівалася толькі на свабодных ці часткова незалежных тэрыторыях і ў суседніх землях (у 1494 у Чарнагорыі іераманах Макарый надрукаваў слав. кірылічную кнігу, у 15 ст. ў рукапісах распаўсюджвалася па Русі «Сербская Александрыя», у 16 ст. на Беларусі зроблены пераклад-пераказ з сербскага перакладу «Аповесці пра Баву Каралевіча»). Сучасная літ. С.м. сфарміравалася ў 1-й пал. 19 ст. на базе наваштокаўскіх гаворак. У яе фарміраванні вызначальнай была дзейнасць В.*Караджыча*. Рэфармаваны ім сербскі кірылічны алфавіт (вуковіца) адлюстроўвае спецыфіку гукавой сістэмы С.м., у т.л. за кошт увядзення спец. графічных знакаў для перадачы спецыфічных сербскіх зычных. Выкарыстоўваецца і лацінка (асабліва ў побытавай сферы).

Літ.: Толстой Н.И. Литературный язык у сербов в конце XVIII — начале XIX в. // Национальное возрождение и формирование славянских литературных языков. М., 1978; Леонова Л.В. Сербскохорватский язык. Мн., 1988; Сокаль Н.И., Зайцева С.В., Вукович Б. Сербский язык. СПб., 1996; Српски језик на крају века. Београд, 1996; Булахов М.Г. Сербский язык // Булахов М.Г. Славянские языки: происхождение, история, современ. состояние. Мн., 2001. *Л.В.Лявонава.*

СЕ́РБСКІЯ ПАЎСТА́ННІ ПАЧА́ТКУ 19 СТАГО́ДДЗЯ, нацыянальна-вызваленчыя нар. паўстанні сербаў у 1-й чвэрці 19 ст. супраць тур. прыгнёту. 1-е сербскае паўстанне 1804—13 пачалося ў лют. 1804 у Бялградскім пашалыку (губерні) пасля забойства янычарамі (студз. 1804) каля 70 найб. папулярных у народзе сербаў. Паўстанне ўзначаліў *Карагеоргій*. Паўстанцы атрымалі некалькі перамог і на пач. 1807 кантралявалі ўсю тэр. Сербіі. Значную дапамогу паўстанцам аказала Расія ў час. рус.-тур. вайны 1806—12. Па патрабаванні галоўнакамандуючага Малдаўскай арміяй М.І.Кутузава ў *Бухарэсцкі мірны дагавор 1812* быў уключаны спец. арт. аб дазволе Сербіі мець унутр. самакіраванне. Выкарыстаўшы тое, што Расія вяла вайну з Францыяй, тры тур. арміі ў 1813 разгромілі паўстанцкае войска і аднавілі ўладу султана. 2-е сербскае паўстанне 1815 фактычна стала працягам першага. Яно пачалося ў крас. ў Бялградскім пашалыку. Кіраўніком паўстання быў абраны ваявода *Мілаш Абрэнавіч*, войскі якога атрымалі шэраг перамог над туркамі. Аднак колькасная перавага тур. войск прымусіла сербаў пайсці на перагаворы з Турцыяй, і пры дыпламат. падтрымцы Расіі было заключана перамір'е. Тур. ўрад прызнаў Мілаша вярх. кнезам (князем) Сербіі, рэгламентаваў памеры падаткаў сербскіх сялян тур. памешчыкам, а права збору падаткаў султану перадаў сербам. Паўстанне стварыла ўмовы для далейшай барацьбы сербаў за ўнутр. аўтаномію, якая завяршылася ў 1830-х г. стварэннем Сербскага княства.

СЕ́РБЫ (саманазва србі), народ, асн. насельніцтва *Сербіі* (6,5 млн. чал., сярэдзіна 1990-х г.). Жывуць таксама ў Босніі і Герцагавіне (1,4 млн. чал.), Харватыі (580 тыс. чал.) і інш. еўрап. краінах, а таксама ў ЗША, Канадзе, Аргенціне, Аўстраліі. Гавораць на *сербскай мове*. Вернікі пераважна праваслаўныя, ёсць католікі і пратэстанты, мусульмане-суніты.

СЕРВА́Ж (франц. servage ад лац. servus раб), від феад. залежнасці сялянства ў Зах. Еўропе ў сярэднія вякі; адна з найб. крайніх форм абмежавання грамадз. і гасп. правоў сялян (серваў). Сервы працавалі на зямлі феадала, былі ў асабістай ад яго залежнасці, падсудныя яго суду, але ў адрозненне ад прыгоннага права ў Расіі юрыдычна не былі прымацаваныя да зямлі. С. характэрны для перыяду феад. раздробленасці. Рост таварнай вытв-сці ў 13—14 ст., адкрытае супрацьпаленне сялян (нар. паўстанні 14—15 ст.) зменшылі значэнне С. У 16—18 ст. С. захаваўся толькі ў асобных адсталых рэгіёнах.

СЕРВА́НТЭС Сааведра (Cervantes Saavedra) Мігель дэ (хрышчаны 9.10.1547, г. Алькала-дэ-Энарэс, Іспанія — 23.4.1616), іспанскі пісьменнік і драматург эпохі Адраджэння. Вучыўся ў калегіуме езуітаў г. Вальядалід (1557—61), у Мадрыдскай гуманіт. школе. З 1568 на службе ў пасла папы Пія V кардынала Дж.Аквавівы. У 1570—75 служыў у войску, удзельнічаў у бітве ісп.-італьян. флоту з туркамі пры Лепанта (1571), дзе была знявечана левая рука. Вяртаючыся на радзіму, трапіў у палон да алж. піратаў, прададзены ў рабства. У 1580 выкуплены, вярнуўся ў Іспанію, служыў зборшчыкам нядоімак. Паводле несправядлівага абвінавачання тройчы трапляў у турму. Доўгія гады жыў у нястачы. Друкаваўся з 1568 (оды, рамансы, санеты і

інш.). Першы значны твор — пастаральны раман «Галатэя» (1585). Аўтар каля 30 п'ес, у т.л. патрыят. драмы «Нумансія» (апубл. 1784), прасякнутай любоўю да свабоды і нянавісцю да рабства, зб-каў «Павучальныя навелы» (1613), «Восем камедый і восем інтэрмедый» (1615), паэмы «Падарожжа на Парнас» (1614), авантурнага рамана «Вандраванні Персілеса і Сіхізмунды» (апубл. 1617). Вяршыня яго творчасці — раман «Хітрамудры гідальга Дон

М. дэ Сервантэс.

Кіхот Ламанчскі» (ч. 1—2, 1605—15). Задуманы як пародыя на рыцарскія раманы, твор выйшаў за межы літ. сатыры, стаў энцыклапедыяй ісп. жыцця мяжы 16—17 ст. У ім намаляваны прыгоды Дон Кіхота — збяднелага дваранiна, які прагнуў сцвердзіць на зямлі гуманіст. ідэалы. Не здольны адрозніваць у жыцці сапраўднае ад выдуманага, ён выбіраў дзіўныя шляхі здзяйснення мараў. У вобразе Санча Пансы, збраяносца Дон Кіхота, увасоблены нар. розум, кемлівасць, гумар. Імя Дон Кіхота стала назыўным для абазначэння высакародных, але не ўсім зразумелых імкненняў. Паводле рамана напісаны оперы Г.Пёрсела, Дж.А.Рысторы, Дж.Паізіела, Н.Пічыні, А.Сальеры, Ж.Маснэ, балеты Ж.Буамарцье, С.Меркадантэ, Л.Мінкуса (паст. Бел. т-рам оперы і балета ў 1941, 1946, 1962, 1979), пастаўлены кінафільмы (Расія, Данія, Францыя). На бел. мову асобныя вершы С. пераклалі А.Зарыцкі, Р.Барадулін, М.Пазнякоў.

Тв.: Бел. пер. — Хітры гідальга Дон Кіхот Ламанчскі. Мн., 1999; У кн.: Кахаць — гэта значыць...: Старонкі з паэзіі свету. Мн., 1986; Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—5. М., 1961; Хитроумный идальго Дон Кихот Ламанчский. Ч. 1—2. Мн., 1988.

Літ.: Державин К.Н. Сервантес: Жизнь и творчество. М., 1958; Снеткова Н.П. «Дон Кихот» Сервантеса. 2 изд. Л., 1970; Багно В.Е. Дорогами «Дон Кихота». М., 1988; Умикян А.Д. Мигель де Сервантес Сааведра: Библиогр. рус. переводов и крит. лит. на рус. яз., 1763—1957. М., 1959.

І.Л.Лапін.

«СЕРВЕ́ЕР» («Surveyor»), серыя амерыканскіх аўтам. касм. апаратаў для даследавання Месяца; праграма іх распрацоўкі. Пасля мяккай пасадкі на паверхню Месяца праводзіліся панарамныя здымкі, даследаванне грунту, таксама адпрацоўваліся некаторыя элементы праграмы «*Апалон*». Маса «С.» на Зямлі ≈ 1 т, пасля пасадкі на Месяц ≈ 285 кг. У 1966—68 запушчаны 7 «С.».

СЕРВІ́З (франц. servise ад servir накрываць стол), поўны набор сталовага ці чайнага посуду з агульным маст. афармленнем. Звычайна разлічаны на пэўную колькасць чалавек (напр., чайны С.).

СЕ́РВІЙ ТУ́ЛІЙ (Servius Tullius; 6 ст. да н.э.), паводле рым. падання, шосты цар Стараж. Рыма [578—534/533 да н.э.]. З яго імем рым. традыцыя звязвае рэформы, накіраваныя на ўмацаванне дзярж. ладу. Важнейшая з іх цэнтурыятная, паводле якой Рым быў падзелены на тэр. акругі (*трыбы*), плебеі ўвайшлі ў склад рым. народа. Стварыў з патрыцыяў і плебеяў адзінае войска. З часоў С.Т. рэгулярна праводзіўся цэнз — перапіс насельніцтва і ацэнка яго маёмасці. Яму прыпісваюць таксама рэліг. рэформы і пабудову гар. сцяны.

СЕ́РВІС (англ. service служба), дабраякасныя абслугоўванне, рамонт ці наладка тэхн. сродкаў, быт. апаратуры, камунальнай тэхнікі і г.д. Адрозніваюць С. перадпрадажны (уключае ліквідацыю няспраўнасцей, выяўленых пасля транспартавання тавару або пры апрабаванні) і пасляпрадажны (падзяляецца на гарантыйны і паслягарантыйны). У гарантыйны перыяд спецыялісты службы С. бясплатна выконваюць усе работы па забеспячэнні бесперабойнай эксплуатацыі вырабу, уключаючы і навучанне спажыўца прыёмам карыстання. У паслягарантыйны перыяд работы выконваюцца за плату.

СЕ́РВІС-ПЕРЫ́ЯД, перыяд ад ацёлу каровы да наступнага яе апладнення (ад заканчэння адной і да пачатку наст. цельнасці). Паказчык плоднасці жывёл і арганізацыі ўзнаўлення статка. Аптымальная працягласць С.-п. ў малочных парод 2—2,5 месяца, што дазваляе штогод атрымліваць прыплод ад кожнай каровы. Павелічэнне С.-п. можа прывесці да перагулу і *ялавасці*.

СЕРВІТУ́ТЫ [ад лац. servitus (servitutis) рабства, падначаленасць], абмежаванае права карыстання чужой уласнасцю. Інстытут С. склаўся ў рым. праве з мэтай прававога ўрэгулявання супрацьлеглых інтарэсаў прыватных уласнікаў. У эпоху феадалізму С. існавалі ў тых краінах, дзе дзейнічала рым. права. Бурж. права таксама захавала і рэгламентавала С. Найб. пашыранымі былі зямельныя С. (права праезду, прагону і выпасу жывёлы, рыбнай лоўлі на чужой тэр., карыстанне сенажацямі, ляснымі ўгоддзямі і інш.), у т.л. на Беларусі, Правабярэжнай Украіне, у Літве, Каралеўстве Польскім, прыбалтыйскіх губ. Расіі. Яны ўяўлялі сабой абшчынныя землі, захопленыя ў сялян памешчыкамі ў час прыгону. Імкненне памешчыкаў зрабіць С. крыніцай дадатковых даходаў стала адной з прычын барацьбы за зямлю паміж сялянамі і феадаламі. У выніку *сялянскай рэформы 1861* зямельныя С. заставаліся ўласнасцю памешчыкаў. За сялянамі захавалася права карыстання гэтымі ўгоддзямі, але «Мясцовыя палажэнні» агаворвалі яго невыразна і недакладна. Ва ўстаўных граматах зямельныя С. нават не называліся, што давала магчымасць памешчыкам пазбаўляць сялян права карыстання імі. На Беларусі і ў Літве толькі *паўстанне 1863—64* прымусіла мясц. ўлады, а потым і царскі ўрад заняцца пытаннем С. Віленскі ген.-губернатар М.М.Мураўёў загадаў пры складанні выкупных актаў часова захаваць за сялянамі права карыстання пашавымі і ляснымі С. да адвядзення ім часткі такіх угоддзяў. Але сервітутныя правы сялян вызначаліся няпэўна, што давала магчымасць памешчыкам для злоўжыванняў. Да пач. 1870-х г. сяляне атрымалі права за вызначаную плату карыстацца палівам з панскіх лясоў. У Зах. і Цэнтр. Беларусі ў 1860-я г. С. карысталіся 56% сял. двароў, надзеленых зямлёй, на пач. 20 ст. — каля трэці б. панскіх сялян. С. ліквідаваны ў выніку Кастр. рэвалюцыі 1917. Сяляне Зах. Беларусі вялі барацьбу за С. да 1939.

Літ.: Палонскі А.В. Пашавыя сервітуты ў парэформенай беларускай вёсцы // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1959. №4; Яго ж. Сервитуты в аграрном строе Белоруссии феодальной формации // Из истории крестьянства Белоруссии: Сб. ст. Мн., 1978; Шабуня К.И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг. Мн., 1962; Мулявичюс Л.П. К вопросу об изучении истории крестьянских сервитутов // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1971 г. Вильнюс, 1974; Панютич В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861—1900 гг. Мн., 1990.

В.П.Панюціч.

СЕРВЭ́ (Servais) Адрыен Франсуа (6.6.1807, каля г. Брусель — 26.11.1866), бельгійскі віяланчэліст, кампазітар, педагог. Вучыўся ў Брусельскай каралеўскай кансерваторыі (1831—34), з 1848 праф. у ёй. Іграў у арк. «Тэатр дэ ла Манэ». Канцэртную дзейнасць пачаў у 1834 у Парыжы. З 1836 гастраліраваў у краінах Еўропы, неаднаразова ў Расіі (з 1839). Выступаў таксама ў ансамблі з А.*В'ётанам* і Ю.Леанарам, сумесна з якімі напісаў шэраг інстр. ансамбляў. Аўтар 2 канцэртаў, 16 фантазій для віяланчэлі. Яго мастацтва вызначалася віртуознасцю выканання, тэмпераментам. Сярод вучняў: яго сын Жазеф С., А.Германоўскі, Я.*Карловіч* і інш.

СЕРГАЧО́Ў Сяргей Аляксеевіч (н. 20.12.1946, Мінск), бел. архітэктар. Канд. архітэктуры (1984). Ган. праф. Паўн.-зах. буд. ін-та КНР (1999). Скончыў БПІ (1969). Працаваў у ін-це «Мінскпраект», БелНДІдзіпрасельбудзе, Мін-ве культуры Беларусі. З 1972 і з 1993 выкладчык БПА (з 1997 заг. кафедры). З 1977 кіраўнік рабочай групы па стварэнні Бел. дзярж. музея нар. архітэктуры і побыту. Адзін са стваральнікаў *Дудзіцкага музея матэрыяльнай культуры* («Дудуткі»). Найб. значныя праектныя работы — жылыя дамы па праспекце

Ракасоўскага і вул. М.Танка ў Мінску (1971—72, у сааўт.). Даследуе гісторыю нар. дойлідства Беларусі, праблемы захавання гіст.-культ. спадчыны, развіцця традыцый у сучаснай архітэктуры. Аўтар шэрагу праектаў рэстаўрацыі помнікаў.

Тв.: Летопись деревянного зодчества Белоруссии. Мн., 1975; Деревянная архитектура Белоруссии XVI— XIX вв. Мн., 1984; Белорусское народное зодчество. Мн., 1992.

СЕРГЕЕ́НКА Мікалай Іванавіч (н. 10.9.1946, в. Доўгавічы Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне анестэзіялогіі і рэаніматалогіі. Д-р мед. н. (1999). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1970). З 1988 у абл. нефралагічнай бальніцы ў г. Віцебск (заг. аддзялення). Навук. працы па пытаннях эмацыянальнай і нейравегетатыўнай аховы арганізма ва ўмовах хірург. агрэсіі.

Тв.: Влияние функциональных взаимоотношений вегетативной нервной системы на течение анестезии, адекватность нейровегетативной защиты и эффективность интенсивной терапии. Витебск, 1998.

СЕРГІЕ́ВІЧ Зміцер Рыгоравіч (н. 8.8.1912, в. Сухое Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. пісьменнік. З 1929 у Мінску. Працаваў у Радыёцэнтры Беларусі. Вучыўся ў Мінскім вышэйшым пед. ін-це (1932). У 1933 рэпрэсіраваны. У 1935 вярнуўся ў г. Калінкавічы Гомельскай вобл. Працаваў на фанернай ф-цы ў Мазыры. У Вял. Айч. вайну на фронце. З 1945 у газ. «За честь Родины» (Вена). З 1950 у газ. «Зищитник Родины» (Адэса). У 1956—61 у газ. Паўд. групы войск «Ленинское знамя» (Будапешт). З 1961 жыве ў Адэсе. Дэбютаваў вершамі на бел. мове ў 1930 (пад псеўд. Змітро Віталін). Аўтар зб. вершаў «Будзем жыць!» (1932). У Адэсе пад сваім прозвішчам на рус. мове выдаў кнігі прозы пераважна на ваен. тэматыку: «На блакітным Дунаі» (1955), «Першы бой» (1957), «Прывітанне з юнацтва» (1964), «Трывожная восень» (1966), «Высокі вострай» (1969), «Маршавая рота» (1971), «Навальніца на світанні» (1973), «Сосны пасярод поля» (1975), «Добрыя прыкметы» (1978), «Няма апошніх рубяжоў» (1982) і інш.

СЕРГІЕ́ВІЧ Мікола (Мікалай Антонавіч; 3.9.1921, в. Залессе Салігорскага р-на Мінскай вобл. — 7.12.2000), бел. пісьменнік, нарысіст. Скончыў Аршанскі настаўніцкі (1939), Магілёўскі пед. (1941) ін-ты. Настаўнічаў, працаваў у «Настаўніцкай газеце», час. «Народная асвета», у 1955—59 старшыня калгаса «Чырвоны пуцілавец» Старобінскага р-на. Друкаваўся з 1947. Аўтар кніг нарысаў «На роднай зямлі» (1956), «Нашы будні» (1957), «Будні калгасныя» (1959), п'ес «Што чула бярозка» (1963), «Расійскія пеўні», «Спалох у вялікім доме», камедыі «Смех і... толькі» (паст. Маладзечанскім нар. т-рам у 1975). Асн. тэма твораў — жыццё вёскі.

СЕРГІЕ́ВІЧ Пётра (Пётр Аляксандравіч; 10.7.1900, в. Стаўрова Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. — 1.11.1984), бел. жывапісец і графік, мастак-манументаліст. Засл. дз. маст. Літвы (1965). Вучыўся на маст. ф-це Віленскага ун-та (1919—22, 1925—27), у Кракаўскай АМ (1924—25). Творчасць вызначаецца вобразнасцю пластычнага і кампазіц. вырашэння, эмац. ладам, цікаўнасцю да самабытнасці бел. нар. культуры, часам алегарычнасцю і рамантычнасцю. Маст. завершанасцю, глыбокім псіхалагізмам, філас. гучаннем вылучаюцца жывапісныя партрэты: «Партрэт маці» (1929), С.Глякоўскага (1938), «Беларуская настаўніца» (1938), «Рыгор Шырма» (1930—40-я г.), «Дзяўчына ў сінім сарафане», «Аўтапартрэт» (абодва 1940), Ф.Багушэвіча, М.Дучыца, «Селянін» (усе 1946), «Партрэт жонкі» (1946, 1957), «Старшыня калгаса» (1952), «Землямер» (1956), М.Танка (1957), «Сталяр», «Нарачанскі рыбак» (абодва 1968) і інш. Гіст. мінулае роднай зямлі, дзейнасць яе выдатных сыноў адлюстроўваюць тэматычныя карціны «Усяслаў Полацкі» (1932), «Кастусь Каліноўскі сярод паўстанцаў 1863 года» (1955), «Скарына ў друкарні» (1957), «К.Каліноўскі і В.Урублеўскі на аглядзе паўстанцаў» (1959), «Скарына ў рабочым кабінеце» (1960), «Арышт П.Багрыма» (1970) і інш. Значнае месца ў творчасці С. займала купалаўская тэма: «А хто там ідзе?», «Званар» (2 варыянты), «А ты, сіраціна, жыві» (усе 1947), «Гусляр», эцюды на тэмы паэмы Я.Купалы «Яна і я» — «Ворыва» і «На сенажаць» (1959), «Партрэт Дамініка Луцэвіча» (1971), трыпціх на тэмы верша Я.Купалы «А зязюлька кукавала» — «Калыханка», «Ясевы універсітэты», «Сейбіт» (1970-я г.) і інш. Жыццю сялян Зах. Беларусі прысвечаны палотны «Перавозка будаўнічага грузу цераз возера Богіна» (1926), «За прасніцай», «Жыццё», «Вяселле на Беларусі» (усе 1929), «Залёты» (1930), «Беларусы» (1930-я г.), «Шляхам жыцця» («Падарожныя», 1934), «Араты» (1938), «Каваль куе каня» (1939), рэв. падзеям у Літве — «Дэманстрацыя беспрацоўных у Каўнасе ў 1925 годзе» (1954). Рэв. пафасам напоўнена карціна «Вясляр» («Насуперак буры», 1940, 2 варыянты). Тэму Вял. Айч. вайны адлюстроўваюць партрэт «Партызан Федзя» (1943), карціна «У партызанскай кузні» (1945). Харство роднай прыроды апяваецца ў пейзажах «Забытая званіца» (1936), «Ноч» (1941), «Пад снегавым пакрывалам» (1942), «Вясновая казка» (1957), тэматычнай карціне «Вячэрняя балада» (1970) і інш. Працаваў таксама ў станковай (серыя партрэтаў «Беларускія народныя тыпы», 1930-я г.) і кніжнай (афармляў час. «Нёман», 1931—32; кнігі М.Машары «На сонечны бераг!», 1934 і «На прадвесні», 1935, і інш.) графіцы. Выканаў размалёўкі ў касцёлах у Солах (1934), Смаргоні (1936), Шарашове (1938); у бернардзінскім касцёле ў Гродне, аформіў касцёл у Корцы (Украіна; 1930-я г.). Аўтар абразоў «Св. Францыск» (1934), «Маці Божая Паразаўская» (1937) і інш. Іл. гл. таксама да арт. *Жывапіс*.

П.Сергіевіч. Шляхам жыцця. 1934.

Тв.: Аўтабіяграфія // Мастацтва. 1993. №1.

Літ.: Ліс. А. Пётра Сергіевіч. Мн., 1970; Крукоўскі У. Невядомы Сергіевіч // Наша вера. 1996. №1; Бажэнава В. Роспісы Пётры Сергіевіча // Там жа. 2001. №1.

Л.У.Салодкіна.

СЕРГІЕ́НКА Раіса Іванаўна (н. 10.7.1945, г. Рэчыца Гомельскай вобл.), бел. музыказнавец. Д-р мастацтвазнаўства (1999). Скончыла Бел. кансерваторыю (1968). З 1967 выкладае ў Бел. акадэміі музыкі. Навук. працы па тэарэт. праблемах музыкі 20 ст., у т.л. «Выканальніцкая інтэрпрэтацыя музычнага твора» (1992), «Гукавышынная аснова музычнай кампазіцыі XX ст.» (1998) і інш.

Тв.: Новыя аспекты гукавышыннай арганізацыі ў беларускай музыцы 60-х гг. // Пытанні культуры і мастацтва Беларусі. 1993. № 12; Беларускі музычны авангард на рубяжы апошніх дзесяцігоддзяў XX ст.: гукавышынная арганізацыя і сучасныя віды кампазіцыйнай тэхнікі // Музычная культура Беларусі: Дыялог часоў. Мн., 1997; Кампазітары Беларусі. Мн., 1997 (разам з Т.Г.Мдзівані); Тембр музыкального звука: новые измерения // Музыкальное искусство на рубеже столетий. Мн., 2000; Высота и звуковой мир современной музыки // Теоретические проблемы музыки XX в. Мн., 2001. Вып. 6.

Э.А.Алейнікава.

СЕРГІЕ́НКА Раіса Міхайлаўна (13.7.1925, г. Новаўкраінка Кіраваградскай вобл., Украіна — 20.3.1987), украінская спявачка (мецца-сапрана). Нар. арт. Украіны (1960). Нар. арт. СССР (1973). Скончыла кансерваторыю ў г. Адэса (1951). Працавала ў Адэскім т-ры оперы і балета. Сярод партый: Наталка («Наталка Палтаўка» М.Лысенкі), Мар'яна («Арсенал» Г.Майбарады), Наташа («Русалка» А.Даргамыжскага) і інш. Выступала ў канцэртах. 2-я прэмія на Усесаюзным конкурсе вакалістаў і артыстаў балета (1956).

СЕ́РГІЕЎ Пётр Рыгоравіч (10.7.1893, с. Срэценскае Кіраўскай вобл., Расія — 12.7.1973), расійскі вучоны ў галіне паразіталогіі і эпідэміялогіі. Акад. АМН СССР (1944). Герой Сац. Працы (1963). Скончыў Казанскі ун-т (1918). З 1927 у Ін-це мед. паразіталогіі і трапічнай медыцыны (у 1934—69 дырэктар). У 1937 нарком аховы здароўя Расіі. У 1957—60 віцэ-прэзідэнт АМН СССР. Навук. працы па эпідэміялогіі маляры і арганізацыі барацьбы з ёй. Кіраваў распрацоўкай комплекснай сістэмы мерапрыемстваў, якія забяспечылі ліквідацыю маляры ў СССР як масавага захворвання. Дзярж. прэмія СССР 1946, 1952.

СЕ́РГІЕЎ ПАСА́Д (у 1925—30 Сергіеў, у 1930—92 Загорск), горад у Маскоўскай вобл. Расіі. Вядомы з 1340. Фарміраваўся вакол *Троіца-Сергіевай лаўры*. 111 тыс. ж. (1999). Чыг. станцыя. З-ды: оптыка-мех., маш.-буд., «Аўтаспецабсталяванне», эл.-мех., хім., лакафарбавы, школьных прылад і інш.; прадпрыемствы лёгкай прам-сці. Вытв-сць лялек. Музей лялек. Увядзенская і Пятніцкая пасадскія цэрквы (16 ст.), Пятніцкі калодзеж (17—18 ст.). Арх. ансамбль Троіца-Сергіевай лаўры ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

СЕ́РГІЕЎСКІЯ МІНЕРА́ЛЬНЫЯ ВО́ДЫ, бальнеагразевы курорт у Расіі, за 12 км на Пн ад г. Сергіеўск Самарскай вобл. Адкрыты ў 1833. Асн. прыродныя лек. фактары: мінер. сульфатна-гідракарбанатныя кальцыева-магніевыя воды і сульфідная глеевая грязь. Лечаць захворванні органаў руху і апоры, крывазвароту, нерв. сістэмы, скуры і гінекалагічныя. Санаторый, бальнеа- і грязелячэбніцы, курортная паліклініка.

СЕ́РГІЙ (у свеце Ахатэнка Рыгор; 24.3.1890, с. Малыя Гарошкі Жытомірскай вобл., Украіна — 2.10.1971), украінскі і бел. рэліг. дзеяч. З 1904 у Богаяўленскім манастыры ў Жытоміры, дзе атрымаў пачатковую духоўную адукацыю. 28.6.1919 прыняў манаства. З 1925 іераманах, з 1932 архімандрыт. Служыў святаром у правасл. прыходах на Украіне. У 1937 арыштаваны, сасланы на прымусовую працу ў г. Бярдзянск. У пач. Вял. Айч. вайны вызвалены. Служыў настаяцелем сабора ў г. Мелітопаль. 1.8.1943 у Кіраваградзе стаў епіскапам Укр. аўтакефальнай правасл. царквы. З 1944 у эміграцыі ў Германіі. Садзейнічаў адбудове *Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы* (БАПЦ) за мяжой. На 1-м саборы БАПЦ у г. Констанц (Германія, 4—5.6.1948) абраны ў склад часовага кіраўніцтва БАПЦ і яе духоўнай кансісторыі. 20.12.1949 выбраны кіраўніком Сабора БАПЦ і ўзведзены ў сан архіепіскапа. З 1950 у Аўстраліі, дзе выконваў абавязкі першаіерарха БАПЦ, праводзіў святарскую дзейнасць сярод бел. вернікаў. *Л.У.Языковіч.*

СЕ́РГІЙ РАДАНЕ́ЖСКІ (свецкае Варфаламей Кірылавіч; каля 1321, с. Варніцы Яраслаўскай вобл., Расія — 25.9.1391), расійскі царкоўны і паліт. дзеяч. У 1330—40 разам з братам заснаваў Троіцкі манастыр (гл. *Троіца-Сергіева лаўра*), каля 1353—91 яго ігумен. Увёў у манастыры агульнажыццёвы статут, якім скасавана асобнае пражыванне манахаў. Пры падтрымцы велікакняжацкай улады, рус. мітрапаліта і канстанцінопальскага патрыярха пашырыў статут на інш. манастыры Паўн.-Усх. Русі, што паспрыяла аб'яднанню манастыроў і ператварэнню іх у буйныя феад. карпарацыі. Паплечнік вял. кн. *Дзмітрыя Іванавіча Данскога*, у 1380 дапамог яму ў падрыхтоўцы Кулікоўскай бітвы, у 1385 уладжваў канфлікт паміж Данскім і разанскім кн. Алегам. С.Р. кананізаваны рус. правасл. царквой (1452). «Жыціе» С.Р. ў 1418 напісаў Епіфаній Прамудры.

Літ.: Борисов Н. Сергий Радонежский. М., 2001.

СЕ́РГУЧ, рака ў Лепельскім і Докшыцкім р-нах Віцебскай вобл., левы прыток р. Бярэзіна (бас. р. Дняпро). Даўж. 47 км. Пл. вадазбору 238 км². Пачынаецца з воз. Тэкліц, цячэ праз азёры Вольшыца, Плаўна і Манец; частка сцёку трапляе ў Бярэзінскі канал (бас. р. Зах. Дзвіна); ніжэй воз. Манец наз. р. Бузянка. Вусце за 4 км на ПнЗ ад в. Крайцы. Працякае па Верхнебярэзінскай нізіне, амаль цалкам у межах *Бярэзінскага біясфернага запаведніка*. Уваходзіла ў склад былой Бярэзінскай воднай сістэмы. Даліна невыразная, каля вытоку трапецападобная, шыр. 0,5—1 км. Пойма двухбаковая, у вытокавай частцы шыр. яе 50—250 м, паблізу ўпадзення ў воз. Вольшыца — 1—1,3 км. Рэчышча ад вытоку да воз. Вольшыца звілістае.

СЕ́РДАВА, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Нача, за 24 км на ПнЗ ад г. Полацк. Пл. 1,1 км², даўж. 2,9 км, найб. шыр. 700 м, найб. глыб. 9 м, даўж. берагавой лініі 6,86 км. Пл. вадазбору 3,6 км². Катлавіна складанага тыпу, мае 2 плёсы. Схілы выш. 10—25 м (на ПнЗ 30—35 м), на З пад выганам, на У пад агародамі; на выш. 2—6 м абразійны ўступ. Пойма (на Пн, ПдУ і З) шыр. 20—30 м, забалочаная, пад хмызняком. Берагі нізкія, пясчаныя, часткова пад хмызняком, на Пн і З сплавінныя. Ёсць 2 вял. (на Пд і З) і некалькі меншых заліваў, 5 астравоў агульнай пл. 9 га. Дно да глыб. 4 м пясчанае, глыбей ілістае. Мінералізацыя вады да 250 мг/л, празрыстасць 1,6 м. Эўтрофнае. Слабапраточнае. Шыр. паласы надводнай расліннасці 2—10 м, пашырана да глыб. 2,2 м; падводная расце да глыб. 2,5—3,5 м. Упадаюць 2 ручаі, на Пн злучана ручаём з воз. Рудзёнкава.

СЕРДАЛІ́К (ад грэч. sardonyx, sardion), карнеол, мінерал, разнавіднасць *халцэдону*. Колер ружовы, аранжавачырвоны, залаціста-жоўты. Трапляецца ў выглядзе запаўнення трэшчын і мігдалін у асн. і сярэдніх эфузівах. Ювелірна-вырабны камень. Гал. прамысл. радовішчы — алювіяльныя і элювіяльныя россыпы; найб. вядомыя ў Індыі, Бразіліі, Уругваі, таксама ў Карадагскім вулканічным масіве (Крым, Украіна) і Забайкаллі (Расія).

Літ.: Банк Г. В мире самоцветов: Пер. с нем. М., 1979; Ферсман А.Е. Драгоценные и цветные камни СССР // Избр. труды. М., 1962. Т. 7.

Сердалік.

СЕРДЗЮКІ́, казакі наёмных пяхотных (сярдзюцкіх) палкоў на *Левабярэжнай Украіне* ў канцы 17 — пач. 18 ст. Набіраліся з добраахвотнікаў: з сялян і збеглых казакоў Правабярэжнай Украіны, валахаў, сербаў, выхадцаў з Беларусі і інш. Утрымліваліся за кошт гетманскай казны і знаходзіліся на поўным яе забеспячэнні. Сярдзюцкія палкі падпарадкоўваліся непасрэдна гетманскаму кіраўніцтву і неслі ваен. і паліцэйскую службу (ахоўвалі гетманскую рэзідэнцыю, ваен. склады, вайск. артылерыю і інш.). Паводле царскага ўказа ад 25.7.1726 сярдзюцкія палкі ліквідаваны з мэтай абмежавання гетманскай улады.

СЕРДЗЮКО́Ў Анатоль Мікалаевіч (н. 15.5.1944, пас. Герой Буда-Кашалёўска-

А.М.Сердзюкоў.

га р-на Гомельскай вобл.), бел. фізік-тэарэтык. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1996), д-р фіз.-матэм. н. (1987), праф. (1988). Скончыў Гомельскі пед. ін-т (1965). З 1965 у Ін-це фізікі АН Беларусі, з 1973 у Гомельскім ун-це (з 1979 заг. кафедры, у 1990—96 прарэктар). Навук. працы па электрадынаміцы і акустыцы гіратропных і хіральных асяроддзяў, тэорыі гравітацыі. Устараніў супя-

рэчнасці, што існавалі ў тэорыях натуральнай гіратрапіі, правёў узгодненне электрадынамічных ўраўненняў з гранічнымі ўмовамі і законамі захавання, устанавіў узаемасувязь паміж рознымі спосабамі фенаменалагічнага апісання гіратрапіі. Пабудаваў самаўзгодненую тэорыю выпрамянення, распаўсюджвання, адбіцця, паглынання, рассеяння і нелінейнага ўзаемадзеяння хваль у хіральных асяроддзях. Разам з інш. выказаў ідэю гіратропнай (спінавай) палярызавальнасці элементарных часціц, даследаваў магчымасці выкарыстання прынцыпу калібровачнай інварыянтнасці ў скалярнай мадэлі гравітацыйнага поля.

Тв.: К феноменологической теории естественной оптической активности (разам з Б.В.Бокуцем) // Журн. эксперимент. и теорет. физики. 1971. Т. 61, №5; Основы теоретической кристаллооптики. Ч. 1—3. Гомель, 1977—78 (з ім жа); К вопросу о поляризуемости и гирации элемент. частиц в полевой теории (разам з Л.Р.Марозам, М.В.Максіменкам) // Ковариантные методы в теоретической физике: Физика элемент. частиц и теория относительности. Мн., 1981; Electromagnetics of bi-anisotropic materials:-Theory and applications. Amsterdam, 2001 (у сааўт.).

А.І.Болсун.

СЕРДЗЮКО́Ў Васіль Васілевіч (н. 1.1.1939, г. Эліста, Калмыкія), бел. артыст аперэты (тэнар). Засл. арт. Беларусі (2000). Скончыў Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва імя А.Луначарскага ў Маскве (1970). З 1970 у Бел. муз. т-ры. Характарны акцёр, ролі ў яго выкананні набываюць яскравы каларыт, эмацыянальную напоўненасць. Сярод партый нац. рэпертуару: Пранцысь («Паўлінка» Ю.Семянякі), Цярэшка Калабок, Юрась, Скамарох («Судны час», «Несцерка» Р.Суруса). Інш. ролі: Рауль, Стэфан, Зупан, Пеніжэк, Чэка, Боні, Напалеон («Фіялка Манмартра», «Марыца», «Сільва», «Баядэра» І.Кальмана), Зупан, Карнера («Цыганскі барон» І.Штрауса), Іанель («Цыганскае каханне» Ф.Легара), Гангстэр («Цалуй мяне, Кэт» К.Портэра), Дыега, Рамон («Пацалунак Чаніты» Ю.Мілюціна), Андрэйка («Вяселле ў Малінаўцы» Б.Аляксандрава), Буба, Арыф («Каўказская пляменніца» Р.Гаджыева), Елпідыфор («Халопка» М.Стрэльнікава).

СЕРДЗЮКО́Ў Мікалай Мікалаевіч (н. 1.10.1948, в. Харошаўка Чачэрскага р-на Гомельскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў Бел. ін-т інжынераў чыг. транспарту (1971), Выш. партыйную школу пры ЦК КПБ (1985). Працаваў інжынерам-канструктарам, у газ. «Гомельская праўда», час. «Нёман» (1985—95). Друкуецца з 1976. Піша на бел. і рус. мовах. Аповесці «Пачынаецца з мяне» (1976) і «Жыццё залатое» (1988) пра складаныя маральныя пытанні жыцця рабочага асяроддзя. Востраскжэтная аповесць «Страчаны рай» (1992) закранае праблемы рэпрэсій, аповесць «Радыяцыя» (1993) — пра чарнобыльскую трагедыю і яе наступствы для бел. народа. Аўтар фантастычных аповесцей «Два бяссмерці» (1977), «Узыход агнёў, або Вярба ў хату» (1995), кнігі публіцыст. нарысаў «Пры сканчэнні лаяльнасці» (1990). На рус. мову пераклаў раман Г.Далідовіча «Заходнікі», нарысы І.Дуброўскага і інш.

Тв.: Страчаны рай: Аповесці. Мн., 1993.

І.У.Саламевіч.

СЕРДЗЯШНО́Ў Анатоль Пятровіч (н. 1.1.1930, в. Крывалучча Саратаўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне электратэхнікі. Канд. тэхн. н. (1969), праф. (1991). Скончыў Саратаўскі ін-т механізацыі сельскай гаспадаркі (1955). З 1963 у Бел. агр. тэхн. ун-це (у 1973—93 заг. кафедры). Навук. працы па эксплуатацыі, тэхн. абслугоўванні і рамонце с.-г. электраабсталявання. Тэарэтычна абгрунтаваў сіметрыраванне напружання ў трансфарматарах, на падставе чаго распрацавана новая марка трохфазных трансфарматараў для 4-праводных эл. сетак.

Тв.: Планирование эксплуатации сельскохозяйственного электрооборудования. Мн., 1992 (разам з Г.І. Януковічам); Техобслуживание и ремонт электрооборудования в сельском хозяйстве: Справ. Мн., 1993 (з ім жа).

Л.В.Бароўка.

СЕРЖПУТО́ЎСКІ Аляксандр Казіміравіч (21.6.1864, в. Бялевічы Слуцкага р-на Мінскай вобл. — 5.3.1940), бел. этнограф і фалькларыст. Правадз. чл. Інбелкульта (1925). Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1884) і Пецярбургскі археал. ін-т (1904). Працаваў настаўнікам нар. вучылішчаў на Мазыршчыне і Случчыне (1884—93), у Мінскім аддз. сялянскага пазямельнага банка і Мінскім паштова-тэлегр. ведамстве (1893—96), на паштамце ў Пецярбургу (1896—1906), у этнагр. аддзеле Рус. музея ў Ленінградзе (1906—30). Узначальваў падкамісію ў Камісіі па складанні этнагр. карт і вывучэнні нац. складу насельніцтва Расіі пры АН, аналагічную камісію ў Рус. геагр. т-ве (РГТ, 1922—23), выкладаў у нядзельным рабочым ун-це (1919—20), бел. школе (1918—23) у Петраградзе. У час працы настаўнікам і ў экспедыцыях па даручэнні Рус. музея сабраў на Беларусі багаты этнагр. і фалькл. матэрыял. У этнагр. нарысе «Беларусы-палешукі» (1908, рукапіс) апісаў пабудовы, побыт, звычаі і вераванні сялян Мазыршчыны і Случчыны. Даследаваў земляробчыя прылады працы, бортніцтва, заняткі, звычаі сябрыны, талакі і інш. («Нарысы Беларусі», 1907—09; «Земляробчыя прылады Беларускага Палесся», 1910; «Бортніцтва на Беларусі», 1914, і інш.); вывучаў таксама побыт рускіх, украінцаў, палякаў, літоўцаў, татараў, народаў Каўказа. Выдаў зб-кі «Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў» (1911), «Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета» (1926), «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» (1930). Захаваўся рукапісны зб. «Беларускія песні», у якім змешчаны 53 тэксты, запісаныя ў канцы 1890-х г. у Мазырскім пав. Рукапісныя зб-кі «Песні Магілёўшчыны» і этнагр. праца «Быт беларусаў» не захаваліся. У 1908 падрыхтаваў да друку зб. бел. прыказак з слоўнікам (збераглася частка рукапісу), за што атрымаў малы залаты медаль Аддзялення этнаграфіі РГТ, у 1912 — рукапісны зб. «Беларускія прыказкі і прымаўкі, запісаныя ў Мазырскім павеце». Вывучаў дыялекты бел. мовы («Граматычны нарыс беларускай гаворкі в. Чу-

А.К.Сержпутоўскі.

Е.Б.Серкебаеў.

дзіна Слуцкага павета Мінскай губерні», 1911), падрыхтаваў да друку «Кароткі слоўнік беларускай дзіцячай мовы» (1919, не захаваўся). У час. «Чырвоны шлях» (1918) апублікаваў шэраг артыкулаў пра станаўленне бел. народнасці, пра паходжанне і сутнасць рэлігіі, а таксама серыю публіцыст. нарысаў (пад псеўд. Навум Смага) у рубрыцы «Малюнкі Беларусі», у якіх апісаў гаротнае жыццё бел. сялян у дарэв. час. Рукапісная спадчына С. зберагаецца ў Музеі этнаграфіі (С.-Пецярбург), Рус. музеі, Рас. АН (С.-Пецярбург), Нац. АН Беларусі.

Літ.: Бондарчик В.К., Федосик А.С. А.К.Сержпутовский. Мн., 1966; Касько У.К. Святло далёкай зоркі. Мн., 1997.

У.К.Касько.

СЕРЖПУТО́ЎСКІ Іосіф Адамавіч (26.3.1826 — пасля 1891), расійскі ваенны дзеяч. Ген. ад кавалерыі ў адстаўцы (1891). З дваран Гродзенскай губ. Скончыў Міхайлаўскае артыл. вучылішча (1847). Удзельнік задушэння *Рэвалюцыі 1848—49 у Венгрыі.* У час *Крымскай вайны 1853—56* вызначыўся пры аблозе крэпасці Сілістрыя (1854) і пры *Севастопальскай абароне 1854—55* (узнагароджаны залатой шабляй «За храбрасць»). У жн. 1862 прызначаны ад'ютантам намесніка ў Царстве Польскім вял. кн. Канстанціна Мікалаевіча. Удзельнік задушэння *паўстання 1863—64.* У 1864—71 камандзір 6-га уланскага Валынскага палка. У 1872—74 назіраў за правядзеннем рэкруцкіх набораў у губернях (у Віленскай губ. ў кастр. 1874). З 1874 камандзір брыгады 5-й кав. дывізіі, у 1881—91 нач. 5-й кав. дывізіі.

А.М.Лукашэвіч.

СЕРКАВІ́ЦА, вёска ў Талачынскім р-не Віцебскай вобл., на аўтадарозе Сянно—Талачын. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 17 км на Пн ад горада і чыг. ст. Талачын, 89 км ад Віцебска. 624 ж., 226 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом куль-

туры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЕРКАВІ́ЦКІ ШКЛОЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1897—1925 ва ўрочышчы Серкавіца Аршанскага пав. (цяпер вёска ў Талачынскім р-не Віцебскай вобл.). Вырабляў паўбелае ліставое шкло і бутэлькі. У 1913 меў 5 паравых рухавікоў, 2 паравыя катлы. У 1910 працавала 297 рабочых, выпушчана 10 тыс. скрынак шкла.

СЕ́РКАВЫ КО́РАК, намнажэнне вушной серы ў вонкавым слыхавым праходзе ад гіперсакрэцыі серных залоз. Выклікае зніжэнне слыху, шум у вушах, нават галавакружэнне. Лячэнне: амбулаторнае выдаленне С.к. шляхам прамывання.

СЕРКЕБА́ЕЎ Ермек Бекмухамедавіч (н. 4.7.1926, г. Петрапаўлаўск, Казахстан), казахскі спявак (лір. барытон). Нар. арт. СССР (1959). Герой Сац. Працы (1986). Скончыў Алма-Аціпскую кансерваторыю (1951). З 1947 саліст Казахскага т-ра оперы і балета. З 1973 выкладае ў Алма-Аціпскай кансерваторыі (з 1982 праф.). Дэбютаваў у партыі Абая («Абай» А.Жубанава і Л.Хамідзі). Сярод інш. партый: Капан («Ер Таргын» Я.Брусілоўскага), Кажагул («Біржан і Сара» М.Тулебаева), Януш («Галька» С.Манюшкі), Яўген Анегін («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Фігара («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Жэрмон («Травіята» Дж.Вердзі), Валянцін («Фауст» Ш.Гуно), Эскамільё («Кармэн» Ж.Бізэ) і інш. Выступае як камерны і эстрадны спявак. Здымаўся ў кіно. Дзярж. прэмія Казахстана 1972. Дзярж. прэмія СССР 1977.

СЕ́РКЕТ, Селкет, у старажытнаегіпецкай міфалогіі і рэлігіі багіня-апякунка мёртвых, дачка *Ра*, якая дапамагала яму знішчаць ворагаў. Свяшчэнная жывёла С. — скарпіён. Выявы С. ў выглядзе жанчыны са скарпіёнам на галаве часта змяшчалі на саркафагах.



Серкет. Статуэтка з грабніцы фараона Тутанхамона. Каля 1350 да н.э.

СЕ́РЛІО (Serlio) Себасцьяна (6.9.1475, г. Балонія, Італія — 1554), італьянскі тэарэтык архітэктуры. Арх. адукацыю атрымаў у Рыме (1514—27) у Б.*Перуцы*. Працаваў у гарадах Пезара, Венецыя, а таксама ў Францыі (з 1541). Пачынаў як майстар перспектыўнага жывапісу. Трактат С., прысвечаны геаметрыі, перспектыве, ант. і тагачасным пабудовам, набыў агульнаеўрап. вядомасць (у 1537—75 друкаваўся асобнымі кнігамі, якія ў венецыянскім выданні 1584 аб'яднаны пад назвай «Архітэктура») і значна паўплываў на развіццё рэнесансавага і раннекласіцыстычнага дойлідства ў Францыі, Нідэрландах і Германіі.

СЕ́РНА, сарна (Rupicapra rupicapra), млекакормячае сям. пустарогіх атр. парнакапытных. Адзіны від роду; 8—9 падвідаў. Пашыраны ў гарах Еўропы і М. Азіі.

Даўж. цела да 140 см, выш. да 85 см, маса да 50 кг. Маюць кручкападобныя рогі даўж. 7—10 см. Шэрсць зімой доўгая, густая, чорна-бурая; летам кароткая, рыжая. Корміцца горнай травяністай расліннасцю, галінкамі кустоў, дрэў і ліпайнікамі. Нараджае 1, зрэдку 2—3 дзіцянят. Аб'ект палявання і развядзення, у некат. месцах здабыча забаронена.

СЕРНАБЫ́К, сарнабык, млекакормячая жывёла сям. пустарогіх, гл. *Орыкс*.

СЕРНАВА́ЦІСТАЯ КІСЛАТА́, тое, што *тыясерная кіслата*.

СЕ́РНАН (Cernan) Юджын (н. 14.3.1934, г. Чыкага, ЗША), касманаўт ЗША. Капітан 1-га рангу ВМС ЗША (з 1976 у адстаўцы). Магістр навук па авіяц. тэхніцы. Скончыў ун-т Перд'ю (г. Лафеет, штат Індыяна; 1956), ваенна-марскую школу (г. Мантэрэй, штат Каліфорнія; 1961). З 1963 у групе касманаўтаў НАСА. 3—6.6.1966 з Т.*Стафардам* здзейсніў палёт (з выхадам у адкрыты космас) на касм. караблі (КК) «Джэміні-9» (як 2-і пілот); 18—26.5.1969 з Стафардам і Дж.*Янгам* — аблёт Месяца як пілот месяцавай кабіны КК «Апалон-10»; 7—19.12.1972 з Х.*Шмітам* і Р.*Эвансам* — палёт на Месяц як камандзір КК «Апалон-17» (на Месяцы прабыў 75 гадз, 3 выхады на паверхню Месяца агульнай працягласцю 22,1 гадз). У космасе правёў 23,6 сут, у т.л. ў адкрытым космасе 24,2 гадз. Залатыя медалі НАСА «За выдатныя заслугі» (2), «За надзвычайныя заслугі». Залаты медаль «Космас» (ФАІ).

СЕ́РНА-САЛАЎЁВІЧ Мікалай Аляксандравіч (25.12.1834, С.-Пецярбург — 26.2.1866), расійскі рэвалюцыйны дзеяч, публіцыст. Вучыўся ў Аляксандраўскім ліцэі (1847—53). З 1853 працаваў у Дзярж. канцылярыі, з 1858 у адстаўцы. З 1860 супрацоўнічаў у выданнях А.І.*Герцэна* і М.П.*Агарова*, у час. «*Современник*». Паплечнік М.Г.*Чарнышэўскага*. Адзін з заснавальнікаў тайнай рэв. арг-цыі «*Зямля і воля*» 1860-х г. Адмоўна ставіўся і да прыгонніцтва, і да капіталіст. ладу, падзяляў ідэі рус. абшчыннага сацыялізму. У 1862 арыштаваны і зняволены ў Петрапаўлаўскую крэпасць, у 1865 сасланы навечна ў Сібір. Па дарозе ў ссылку наладзіў кантакты з удзельнікамі *паўстання 1863—64*. Загінуў у час падрыхтоўкі паўстання ссыльных у Сібіры. Аўтар прац па філасофіі, эканоміцы, сацыялогіі, праве, шэрагу літ.-мастацкіх твораў.

Ю.Сернан.

М.А.Серна-Салаўевіч.

СЕ́РНАЯ КІСЛАТА́, моцная двухасноўная к-та, H_2SO_4; адзін з асн. прадуктаў хім. прам-сці.

Серна: 1 — самец; 2 — самка.

Бязводная (100%-ная) С.к. — бясколерная масляністая вадкасць, шчыльн. 1830,5 кг/м^3 (20 °С), $t_{пл}$ 10,4 °С, $t_{кіп}$ 296,2 °С (кіпіць з раскладаннем). З вадой і трыаксідам серы SO_3 (гл. *Серы аксіды*) змешваецца ў любых суадносінах. У водных растворах практычна цалкам дысацыіруе на іоны. Канцэнтраваная С.к. — моцны акісляльнік (асабліва пры нагрэванні); акісляе многія металы (напр., медзь, ртуць), неметалы (вугляród, серу і інш.), броміды і ёдзіды вадарод. Разбаўленая ўзаемадзейнічае з актыўнымі, размешчанымі ў электрахім. радзе напружанняў да вадароду, металамі з вылучэннем вадароду. Утварае солі *сульфаты* і *гідрасульфаты*, а таксама эфіры (сульфаты арган.). У прам-сці С.к. атрымліваюць кантактным і нітрозным (вежавым) спосабамі. Зыходнае рэчыва для атрымання С.к. — дыаксід серы, які акісляюць да SO_3 кіслародам пры 440 °С у прысутнасці каталізатара (кантактны спосаб) або аксідамі азоту, растворанымі ў С.к. (нітрозны спосаб). Выкарыстоўваюць у выты-сці мінер. угнаенняў, розных мінер. кіслот і солей, лек. і мыйных сродкаў, фарбавальнікаў, хім. валокнаў, выбуховых рэчываў, а таксама для ачысткі нафтапрадуктаў, у металургіі і гідраметалургіі урану, медзі, нікелю і інш. металаў, як электраліт у свінцовых акумулятарах, асушальнік і інш. С.к. — вельмі агрэсіўнае рэчыва (клас небяспечнасці 2), выклікае цяжкія апёкі скуры, пара пашкоджвае слізістыя абалонкі і лёгкія; ГДК аэразолю С.к. ў атм. паветры 0,1 мг/м^3 (сярэднясутачная); смяротная канцэнтрацыя 0,18 мг/л (экспазіцыя 60 мін).

Літ.: Васильев Б.Т., Отвагина М.И. Технология серной кислоты. М., 1985.

Я.Г.Міляшкевіч.

СЕ́РНЫ КАЛЧАДА́Н, другая назва мінералу *пірыт*.

СЕ́РНЫ ЭФІ́Р, тое, што *дыэтылавы эфір*.

СЕ́РНЫЯ ЎГНАЕ́ННІ, злучэнні *серы*, якія выкарыстоўваюцца ў якасці крыніцы сернага жыўлення раслін. Да іх належаць сульфаты амонію, калію, магнію, таксама гіпс, фосфагіпс, арган. ўгнаенні. Уносяць С.ў. ў глебы з нізкім утрыманнем серы (саланцы, саланчакі), эфектыўныя на падзолістых пясчаных глебах. Асабліва неабходныя для вырошчвання крыжакветных, бабовых культур, сланечніку, бульбы. Нейтралізуюць шчолачнасць глебы (гл. *Гіпсаванне глебы*), павышаюць засваяльнасць цукараствараль-ных фасфатаў, павялічваюць растваральнасць кальцыю, калію, жалеза, магнію.

СЕРО́ЗНАЯ АБАЛО́НКА, абалонка, якая высцілае сценкі поласцей цела, укрывае размешчаныя ў іх органы. Складаецца са шчыльнай валакністай злучальнай тканкі, пакрытай эпітэліем. У залежнасці ад месца размяшчэння С.а. наз. *брушынай*, *плеўрай*, перыкардам. Выконвае ахоўную функцыю ў якасці серозна-гематалімфатычнага бар'ера. Пры паталаг. працэсах можа ўтвараць спайкі, прадуцыраваць залішнюю колькасць серознай вадкасці (напр., пры асцыце, гідраперыкардзе). Запаленне С.а. — серазіт (*перытаніт*, *плеўрыт*, *перыкардыт*).

А.С.Леанцюк.

«СЕРП І МО́ЛАТ», залаты медаль у СССР, устаноўлены ў 1940 як знак асаблівай адзнакі *Героя Сацыялістычнай Працы*.

СЕРПАНЦІ́Н [франц. serpentin ад лац. serpens (serpentis) змяя], скрутак вузкай доўгай каляровай папяровай стужкі, якую кідаюць у публіку на карнавалах, маскарадах, балях. У пераносным значэнні С. наз. участкі звілістай горнай дарогі.

СЕРПЕНТА́РЫЙ [ад лац. serpens (serpentis) змяя], памяшканне для масавага ўтрымання *змей* з мэтай атрымання ад іх яду; разнавіднасць *тэрарыума*. Бываюць таксама дэкар. і дэманстрацыйныя (у заапарках). Першы С. створаны ў Парыжы (1895), потым у Бразіліі (1899). На Беларусі С. існуюць у в. Шчытоўка Сенненскага р-на (з 1987), у пас. Бараўляны пад Мінскам (1988). С. Туркменіі і Азербайджана спецыялізуюцца на атрыманні яду *гюрзы*, *кобры*, *эфы*; Бішкекскі (Таджыкістан), Падмаскоўны (Расія), на Беларусі С. працуюць з *гадзюкай звычайнай*. Змяіны яд выкарыстоўваецца пераважна ў фармацэўтычнай і біяхім. прам-сці (вырабляецца больш за 30 лек. прэпаратаў).

СЕРПЕНЦІ́Н [ад лац. serpens (serpentis) змяя], мінерал падкласа слаістых сілікатаў, $Mg_3[Si_2O_5](OH)_4$. Змяшчае аксід магнію MgO да 43%, прымесі жалеза, алюмінію, нікелю і інш. Крышталізуецца ў манаклінай сінганіі. Утварае скрытакрышт. шчыльныя масы, агрэгаты зблытана-валакністыя, паралельна-валакністыя, лускавінкавыя і інш. Гал. структурныя разнавіднасці С. — антыгарыт (мікралускаватая, пласціністая), лізардыт (тонказярністая) і хрызатыл

Серпенцін.

(тонкавалакністая). Колер зялёны розных адценняў, зрэдку белы, жоўты, блакітны і лілова-сіні (хрызатыл-азбест). Цв. 2,5—3,5. Шчыльн. 2,55 г/см^3. Утвараецца пры метасаматычных працэсах з удзелам гідратэрмальных растворaў за кошт змены ультраасн. парод. С. — частка пароды *серпенцініт*. Крыніца здабычы нікелю; выкарыстоўваецца як аблiцовачны і вырабны камень. Гл. таксама *Азбест*.

СЕРПЕНЦІНІ́Т, змеявік, метамарфічная горная парода, якая складаецца з мінералаў групы *серпенціну*. Утвараецца пры гідратэрмальным змяненні пераважна ультраасноўных парод (гіпербазітаў), у выніку чаго іх бязводныя сілікаты магнію гідралізуюцца і пераўтвараюцца ў мінералы групы серпенціну, а самі горныя пароды ў С. З працэсам серпенцінізацыі звязана ўтварэнне большасці радовішчаў хрызатыл-азбесту (гл. *Азбест*). Выкарыстоўваецца ў буд-ве (аблiцовачны матэрыял) і ювелірнай справе (паўпразрыстыя разнавіднасці — офікальцыт).

СЕ́РПУХАЎ, горад у Маскоўскай вобл. Расіі. Прыстань на р. Ака, пры ўпадзенні р. Нара. Вядомы з 1339. 132 тыс. ж. (1999). Чыг. станцыя. Прам-сць: маш.-буд. і металаапр., хім., харч., тэкстыльная; выты-сць буд. матэрыялаў. Гіст.-маст. музей. Серпухаўскі крэмль, ансамблі Уладычнага (16—17 ст.) і Высоцкага (16—18 ст.) манастыроў, цэрквы (17—18 ст.), жылыя асабнякі (18—19 ст.). Каля С. — *Прыокска-тэрасны запаведнік*. Каля С. ў г. Пушчына радыёастранамічная абсерваторыя і рас. інавацыйны біятэхнал. цэнтр «Пушчына»; у г. Протвіна — навук. комплекс Ін-та фізікі высокіх энергій, у т.л. Серпухаўскі сінхрафазатрон.

СЕРТО́РЫЙ Квінт (Quintus Sertorius, каля 122—72 да н.э.), рымскі палкаводзец. Удзельнік войнаў супраць *кімвраў* і *тэўтонаў* (105, 102), легат у *Саюзніцкай вайне 90—88 да н.э.*, прыхільнік *Марыя* і *Цыны* ў іх барацьбе з *Сулам* у час грамадз. войнаў 88—82 да н.э. У 83—81 да н.э. прэтар Блізкай Іспаніі (рым. правінцыя на ўсх. узбярэжжы Іспаніі). З 80 да н.э. ўзначаліў барацьбу іберыйскіх плямён супраць Рыма, ператварыў Іспанію ў цэнтр антысулаўскай апазіцыі. Аб'яднаў пад сваёй уладай амаль усю Іспанію, атрымаў шэраг перамог над рым. палкаводцамі Метэлам і Гнеем *Пампеем*. Забіты змоўшчыкамі з ліку сваіх прыбліжаных, якія шукалі прымірэння з Рымам.

СЕРТЫФІКА́Т (франц. certificat ад лац. sertifico сведчу), дакумент (пасведчанне) аб якасці прадукцыі, праве яго ўладальніка карыстацца або валодаць чым-н., аб наяўнасці пэўных ведаў, уменняў і інш. Напр., дакумент на гатунковасць і якасць насення, крэдытнай установы, страхавога агенцтва, пасведчанне аб заканчэнні спец. курсаў навучання, мед. даведка аб прышчэпліванні і інш.

СЕРТЫФІКА́ЦЫЯ (ад *сертыфікат*), сістэма захадаў і дзеянняў, якія пацвярджаюць, што фактычная характарыстыка прадукту адпавядае патрабаванням міжнар. стандартаў, рэкамендацыям або інш. дакументам, якія існуюць на сусв. рынку ці ў асобнай краіне. Служыць сродкам абароны пакупнікоў ад з'яўлення на рынку тавараў, што могуць пагражаць здароўю людзей або навакольнаму асяроддзю. Часта ўжываецца ў міжнар. гандлі як нетарыфны бар'ер для абароны нац. рынку ад засілля імпартных тавараў. Адрозніваюць сама-

сертыфікацыю, якая ажыццяўляецца прадпрыемствам-вытворцам або іх аб'яднаннямі, і С., якую выконвае трэцяя асоба. Асн. ўмовы самасертыфікацыі: прадукт павінен цалкам адпавядаць патрабаванням стандартаў, тэхн. умоў, дагавораў і інш. дакументаў; высокі ўзровень сістэмы комплексных выпрабаванняў і кантролю якасці ад сыравіны да ўпакоўкі і маркіроўкі тавараў; адказнасць (у т.л. юрыдычная) вытворцы за якасць С. і дакладнасць сертыфіката; даступнасць пакупнікоў да інфармацыі аб метадах выпрабаванняў, аб сістэме кантролю за якасцю вырабу. С. трэцяй асобай ажыццяўляецца сертыфікацыйным цэнтрам краіны, які не мае дачыненняў ні да вытв-сці, ні да пастаўкі дадзенага тавару. Перавагі такой С.: незалежнасць, аднолькавасць патрабаванняў да прадукту і сістэм кантролю, раўнапраўе бакоў, зацікаўленых у С.

На Беларусі С. ажыццяўляецца Камітэтам па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, дзейнічае Нац. сістэма С. — БелСТ. Яна прадугледжвае: С. прадукцыі, паслуг, сістэм якасці і персаналу; інспекцыйны кантроль; падрыхтоўку і атэстацыю экспертаў-аўдытараў; вядзенне рэестра БелСТ, а таксама дзярж. кадастру службовай і грамадз. зброі і інш. Прадпрыемствам, што сертыфікавалі сваю прадукцыю ў БелСТ, даецца права яе маркіроўкі знакам адпаведнасці. *М.П.Мацвейка, З.Я.Ягорава.*

СЕРУЭ́Л, позназімовы сорт яблыні. Атрыманы ў БелНДІ пладаводства скрыжаваннем сартоў Серынка і Уэлсі. На Беларусі ўключаны ў Дзярж. рэестр для выкарыстання па ўсёй тэрыторыі.

Дрэва сярэднярослае, з круглаватай кронай сярэдняй гушчыні і паніклымі канцамі галін. Сорт скараспелы, высокаўраджайны, сярэдняўстойлівы да грыбных хвароб. Зімаўстойлівасць недастатковая. Пладаносіць на 4—5-ы год. Плады вышэй сярэдняй велічыні (каля 150 г), круглавата-канічнай формы. Скурка светла-зялёная з цёмна-чырв. размытымі палосамі з сонечнага боку. Мякаць зеленаватая, сакавітая, прыемнага кісла-салодкага смаку. Збор пладоў у вер., захоўваюцца да сак.— красавіка. *З.А.Казлоўская.*

СЕРХЕ́Д, пласкагор'е на ПдУ Ірана, у складзе Усх.-Іранскіх гор. Даўж. каля 400 км, шыр. да 200 км. Выш. хрыбтоў 2500—3000 м (найб. 4042, вулкан Тэфтан), далін і ўпадзін каля 1500 м. Горныя пустыні і паўпустыні з зараснікамі калючых падушкападобных хмызнякоў, вышэй за 2000 м — горныя стэпы. Багарнае земляробства на спадзістых схілах. Заказнік Безман.

СЕ́РЫ АКСІ́ДЫ, хімічныя злучэнні *серы* з кіслародам. Найб. пашыраныя аксіды серы (IV), ці серы дыаксід SO_2, і аксід серы (VI), ці серы трыаксід SO_3.

Серы дыаксід (сярністы ангідрыд, сярністы газ) — бясколерны газ з рэзкім пахам, шчыльн. 2,926 кг/м^3, $t_{пл}$ -75,46 °С, $t_{кіп}$ -10,6 °С. Добра растваральны ў вадзе, этаноле, дыэтылавым эфіры. Водны раствор SO_2 — сярністая кіслата H_2SO_3; моцная двухасноўная к-та, якая існуе толькі ў растворы, утварае солі — *сульфіты* і гідрасульфіты. Уваходзіць у склад вулканічных газаў. У прам-сці атрымліваюць абпальваннем *пірыту*. Выкарыстоўваюць пераважна ў вытв-сці сернай к-ты, а таксама як аднаўляльнік, антыаксідант, для адбельвання шэрсці, шоўку і інш., кансервавання агародніны, садавіны; вадкі — як холадагент. Серы трыаксід (серны ангідрыд) — бясколерная вадкасць (пры пакаёвай т-ры), $t_{кіп}$ 44,7 °С; пры т-ры ніжэй за 16,8 °С — празрыстыя крышталі (α=SO_3). У прысутнасці вельмі нязначнай колькасці вільгаці (1 моль вады на 10^6 моль SO_3) полімерызуецца і цвярдзее; цвёрды існуе ў β- , γ- і δ-мадыфікацыях ($t_{пл}$ 32,5, 62,2 і 95 °С адпаведна). Бурна (з выпучэннем вял. колькасці цяпла) узаемадзейнічае з вадой, утварае *сярную кіслату*. У вільготным паветры «дыміць». Растваральна ў канцэнтраванай сернай кіслаце (раствор наз. *алеумам*). Моцны акісляльнік. Атрымліваюць каталітычным акісленнем SO_2. Выкарыстоўваюць для вытв-сці сернай к-ты, олеума, сінтэзу шматлікіх арган. рэчываў, для гідратацыі пры вытв-сці азотнай к-ты. С.а. атрутныя; пашкоджваюць слізістыя абалонкі органаў дыхання, серны ангідрыд выклікае цяжкія апёкі скуры. SO_2 — адзін з асн. ядаў, што атручваюць навакольнае асяроддзе, ГДК у атм. паветры 0,5 мг/м^3. *А.П.Чарнякова.*

СЕ́РЫ ФТАРЫ́ДЫ, неарганічныя бінарныя злучэнні *серы* з *фторам*. Найб. пашыраны серы гексафтарыд SF_6 і тэтрафтарыд SF_4. Вядомы таксама дытыядэкафтарыд S_2F_{10} і дытыядыфтарыд S_2F_2, якія раскладаюцца пры награванні.

Серы гексафтарыд — бясколерны газ без паху, $t_{пл}$ -50,8 °С, пры т-ры -64 °С узганяецца. Не растваральна ў вадзе, этаноле, дыэтылавым эфіры. Тэрмічна ўстойлівы да 700°С. Хімічна інертны; не ўзаемадзейнічае з к-тамі і шчолачамі. Мае нізкую цеплаправоднасць, добры дыэлектрык. Выкарыстоўваюць як ізалятар, холадагент (тэхн. назва — элегаз) у трансфарматарах, высакавольтнай апаратуры, рабочае цела ў газавых хім. лазерах і інш. Серы тэтрафтарыд — бясколерны газ з рэзкім пахам, $t_{пл}$ -121 °С, $t_{кіп}$ -38 °С. Растваральна ў бензоле; вадой і яе парай раскладаецца. Выкарыстоўваюць для селектыўнага фтарыравання кіслародзмяшчальных арган. злучэнняў, атрымання SF_6. С.ф. таксічныя; пашкоджваюць слізістыя абалонкі, дыхальныя шляхі; ГДК у атм. паветры для SF_4 0,5 мг/м^3, для SF_6 0,001 мг/м^3.

СЕ́РЫ ХЛАРЫ́ДЫ, неарганічныя бінарныя злучэнні *серы* з *хлорам*. Практычна найб. важны — дытыядыхларыд S_2Cl_2, ці серы хларыд.

Серы хларыд — масляністая вадкасць з непрыемным пахам; чысты S_2Cl_2 — бясколерны, тэхн. — зеленавата-жоўты, $t_{пл}$ -80 °С, $t_{кіп}$ 137 °С (кіпіць з раскладаннем), шчыльн. 1678 кг/м^3. Растваральна ў этаноле, бензоле, дыэтылавым эфіры. Вадой гідралізуецца (раскладаецца). Пры хлараванні S_2Cl_2 атрымліваюць серы дыхларыд SCl_2 — чырвоная вадкасць, шчыльн. 1621 кг/м^3 (15 °С). Выкарыстоўваюць S_2Cl_2 для халоднай вулканізацыі каўчуку, сінтэзу хларыдаў, у вытв-сці інсектыцыдаў; SCl_2 для атрымання тэтрафтарыду серы (гл. *Серы фтарыды*). С.х. таксічныя, пашкоджваюць слізістыя абалонкі, дыхальныя шляхі; ГДК у атм. паветры для S_2Cl_2 0,3 мг/м^3.

СЕРЫ́ЙНАЯ ВЫТВО́РЧАСЦЬ, тып арганізацыі вытв-сці, калі на прадпрыемстве адначасова вырабляецца шырокая наменклатура аднароднай прадукцыі, выпуск якой паўтараецца праз пэўны час. Колькасць прадукцыі, што вырабляецца адначасова, наз. памерам серыі, а колькасць дэталей — памерам партыі. У залежнасці ад памераў і частаты чаргавання серый адрозніваюць буйнасерыйную, сярэднесерыйную і дробнасерыйную вытв-сць. Пры буйнасерыйнай вытв-сці прадукцыя вырабляецца працяглы час (звычайна не менш як год) і ў вял. аб'ёмах. На прадпрыемствах шырока выкарыстоўваюцца паточныя лініі, канвееры і сродкі аўтаматызацыі; вытв-сць набывае рысы масавага тыпу (гл. *Масавая вытворчасць*). Пашырана ў аўтамабільнай, трактарнай прам-сці. Пры сярэднесерыйнай вытв-сці спецыялізацыя абмяжоўваецца больш вузкай наменклатурай. Да яе адносяцца, напр., станка- і маторабудаванне, выпуск пракату чорных і каляровых металаў. Дробнасерыйная вытв-сць набліжаецца да адзінкавай. Выраб прадукцыі звычайна не паўтараецца. Памер серый няўстойлівы, збыт абмяжоўваецца заказамі або дагаворамі. Да дробнасерыйнай адносіцца вытв-сць асобых відаў сплаваў, пракату. С.в. дае магчымасць больш эфектыўна выкарыстоўваць высокапрадукц. абсталяванне, павышаць якасць прадукцыі, зніжаць яе сабекошт. *У.Г.Залатагораў.*

СЕРЫ́ЙНАЯ ТЭ́ХНІКА, серыйнасць, у музыцы — тэхніка муз. кампазіцыі, якая карыстаецца серыяй — пэўным радам гукаў, паўтарэнне якога ўтварае ўсю тканіну твора або яго часткі. Від С.т. — дадэкафонная тэхніка (гл. *Дадэкафонія*, *Серыяльнасць*). Шырока выкарыстоўваецца ў творчасці кампазітараў нававенскай школы (А.Берг, А.Веберн, А.Шонберг), А.Шнітке, Дз.Смольскага.

Літ.: Когоутек Ц. Техника композиции в музыке XX в.: Пер. с чеш. М., 1976.

В.С.Клакоцкая.

СЕ́РЫКАЎ Іван Арцёмавіч (2.7.1919, в. Наркі Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 20.11.1997), бел. балетмайстар. Засл. дз. культ. Беларусі (1968). З 1945 саліст Ансамбля бел. нар. песні і танца Бел. філармоніі, балетмайстар Ансамбля песні і танца Бел. ваен. акругі. З 1961 маст. кіраўнік і балетмайстар Віцебскага нар. ансамбля песні і танца «Маладосць» Палаца культуры ўпраўлення быт. абслугоўвання насельніцтва. Стварaў пастаноўкі ў Дзярж. ансамблі танца Беларусі і Дзярж. акад. нар. хоры Беларусі. Творчаму почырку С. ўласціва шырокае выкарыстанне разнастайных харэагр. малюнкаў, захаванне фалькл. танц. вобразаў у пастаноўках на сучасныя тэмы, выкарыстанне нац. нехарэагр. элементаў (бел. гульні, вясельныя абрады). Сярод пастановак танцы: «Бульба», «Лявоніха», «Полечка-Віцябляначка», «Стрыкач», «Малацілачка», «Мы з Віцебска», «Лебядзіначка», «Дубочак», «Лучыначкі», «У сваты», «Маталіха», «Груздаўская полька», «Дударыкі» і інш.

Г.М.Водчыц.

СЕРЫ́Н, палярная *амінакіслата*, $OHCH_2CH(NH_2)COOH$. Сінтэзуецца ў жывёльных і расл. арганізмах. Уваходзіць у састаў актыўнага цэнтра многіх ферментаў, *фосфаліпідаў* і інш.

Белае крышт. рэчыва, добра растварaецца ў вадзе, т-ра плаўлення 223—228 °С. Удзельнічае ва ўтварэнні сувязей паміж вугляводнай і бялковай ч. *глікапратэідаў*. С. неабходны для сінтэзу амінаспірту *сфінгазіну*, які ўваходзіць у састаў *сфінгаліпідаў* (разам з фосфаліпідамі складаюць асн. масу ліпідаў мозга). Можа ўтварацца з гліцыну. *І.М.Семяненя.*

СЕРЫ́Р, найбуйнейшае нафтавае радовішча ў Лівіі. Уваходзіць у *Сахара-Лівійскі нафтагазаносны басейн*. Адкрыта ў 1961, распрацоўваецца з 1966. Паклады ніжнемелавога ўзросту на глыб. 2,5—2,7 км. Пач. запасы 2826 млн. т. Шчыльн. нафты 0,84 г/см^3.

СЕ́РЫЯ (ад лац. series рад), 1) шэраг аднародных прадметаў, аб'яднаных якой-н. агульнай прыкметай; таксама паслядоўны рад дзеянняў, падзей, з'яў (напр., С. брашур, С. доследаў). 2) Шэраг вырабаў, машын, дэталей, зробленых па адным узоры. 3) Частка вял. кінафільма, якая дэманструецца самастойна на працягу цэлага сеанса. 4) Катэгорыя, разрад каштоўных папер, дакументаў, якія абазначаны літарамі або лічбамі.

СЕ́РЫЯ ў мастацтве, шэраг твораў (больш за 3) *станковага мастацтва*, звязаных адзінствам задумы. Работы адной С. часцей выконваюцца ў адным стылі і маштабе. З часоў імпрэсіянізму С. — група станковых работ, звязаных адзінствам прадмета выяўлення, напр., колеравае вырашэнне, асвятленне або дынаміка прасторавага ўспрыняцця. Гэта ідэя перанята ў яп. мастакоў (К.Утамара, К.Хакусай і інш.). У мастацтве постмадэрнізму і сучасным, асабліва ў графіцы, папулярныя С., якія складаюцца з блізкіх варыянтаў адной тэмы. С. — больш вузкае паняцце *цыкла*.

СЕ́РЫЯ ГЕАЛАГІ́ЧНАЯ, буйное падраздзяленне мясц. і рэгіянальных стратыграфічных схем; стратыграфічная адзінка. Уключае магутныя і складана пабудаваныя асадкавыя, вулканічныя, вулканагенна-асадкавыя, метамарфізаваныя тоўшчы, якія фарміраваліся на працягу адзінага буйнога седыментацыйнага этапа і адпаведнага яму вулкана-магматычнага або тэктанічнага цыкла. Складаецца з некалькіх (дзвюх і больш) *світ геалагічных*. Паводле аб'ёму можа адпавядаць *аддзелу* адзінай стратыграф. шкалы або быць большай ці меншай за яго. Межамі серыі ў платформавых абласцях з'яўляюцца паверхні вял. рэгіянальных нязгоднасцей і стратыграф. перарываў, у геасінклінальных — вулканагенныя або інтрузіўнамагматычныя ўтварэнні. На Беларусі С.г. вылучаны ў крышт. фундаменце і платформавым чахле. Напр., складанапабудаваныя тоўшчы метамарфічных парод архейска-раннепратэразойскага фундамента падзяляюцца на шчучынскую, кулажынскую, аколаўскую і жыткавіцкую серыі; у адкладах платформавага чахла вылучаюцца: бабруйская, шаровіцкая і беларуская (палеская) серыі ў рыфеі; вільчанская, валынская і валдайская ў вендзе; балтыйская і высокаўская ў кембрыі, беліцкая ў неагене. *С.А.Кручак.*

СЕРЫЯ́ЛЬНАСЦЬ, серыялізм (ад ням. serielle Musik), у музыцы — від *серыйнай тэхнікі*, пры якім серыйны прынцып распаўсюджваецца больш чым на 1 параметр муз. кампазіцыі: вышыню, рытм, агогіку, тэмп і інш. Звязана з новай арганізацыяй муз. «прасторы-часу». Элементы С. сустракаюцца ў творах Л.Берыо, А.Веберна, Э.Дзянісава, Л.Ноно, К.Штокгаўзена. *В.С.Клакоцкая.*

СЕРЭМБА́Н (Seremban), горад у Малайзіі, на ПдЗ п-ва Малака. Адм. ц. штата Негры-Сембілан. Каля 150 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд., тэкст., дрэваапр., гумава-тэхн., харчовая. У навакольлі — здабыча волава.

СЕРЭНА́ДА (франц. sérénade, італьян. serenata ад sera вечар), 1) вячэрняя песня пад акампанемент лютні, мандаліны ці гітары, звернутая да каханай. Узнікла ў Італіі, пашырылася ў паўд.-раманскіх народаў. Пазней стала жанрам камернай вак. музыкі. Сярод вядомых камерных вак. С. «Начны зефір» М.Глінкі, «Пецярбургскія серэнады» А.Даргамыжскага, «Серэнада Дон Жуана» П.Чайкоўскага, «Вячэрняя серэнада», «Ранішняя серэнада» Ф.Шуберта. 2) Інструментальны муз. твор у 17—20 ст., блізкі да *дывертысмента*, *накцюрна*, касацыі. Найб. вядомыя «Хафнераўская серэнада» і «Маленькая начная музыка» В.А.Моцарта, «Італьянская серэнада» Х.Вольфа, «Серэнада для струннага аркестра» Чайкоўскага. *Л.А.Шымановіч.*

СЕРЭНГЕ́ЦІ (Serengeti), нацыянальны парк (з 1951) у Танзаніі на аднайм. плато (выш. 1000—2000 м). Засн. ў 1940 як рэзерват. Пл. каля 13 тыс. км^2. У 1959 вылучаны асобны рэзерват Нгарангора, які ўключае гіганцкі кратэр і плато. Пераважаюць травяністыя саванны з участкамі хмызнякоў і асобнымі дрэвамі; у рачных лагах — галерэйныя лясы. У парку каля 1,5 млн. буйн. млекакормячых, пераважна капытных (антылопа гну, газелі Томсана і Гранта, зебра, насарог, кафрскі буйвал, жырафа і інш.), звычайныя афр. слон, леў, гепард, леапард. Больш за 200 відаў птушак, у т.л. фламінга, венцаносны журавель, буселябіру. Міжнар. НДІ і мемарыяльная лабараторыя імя ням. заолага М.Гржымека.

СЕ́СІЯ (ад лац. sessio пасяджэнне), 1) арганізацыйная форма работы прадстаўнічага органа, суда, міжнар., навук. ці грамадскай арганізацыі і інш. 2) Перыяд здачы экзаменаў у сярэдніх спец. і вышэйшых навуч. установах, дзе прынята прадметна-курсавая ці курсавая форма адукацыі. У навуч. годзе (дзённая і вячэрняя форма адукацыі) 2 С.: зімовая і веснавая.

СЕ́СПЕЛЬ Мішы (сапр. Кузьмін Міхаіл Кузьміч; 16.11.1899, в. Сеспель Канашскага р-на, Чувашыя — 15.6.1922), чувашскі паэт; адзін з заснавальнікаў чув. сав. л-ры. Друкаваўся з 1917. У вершах апяваў радасць стваральнай працы і чалавека працы. Увёў у чув. паэзію сілаба-танічны верш. На бел. мову яго асобныя вершы перакладалі Е.Лось, Ю.Свірка.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Песні волжскага краю: Старонкі чуваш. паэзіі. Мн., 1988; Рус. пер. — Стальная вера. М., 1957.

СЕСТРАРЭ́ЦК, кліматычны і бальнеагразевы курорт у Ленінградскай вобл., паўн. ч. г. Сестрарэцк, Расія. Засн. ў 1898. Клімат прыморскі. Асн. прыродныя лек. фактары — сапрапелевыя гразі і мінер. радонавая хларыдная натрыевая вада з мінералізацыяй 1,12 г/л. Лечаць захворванні сардэчна-сасудзістай сістэмы, органаў стрававання, руху і апоры. Санаторый «Сестрарэцкі курорт», пясчаны пляж.

Да арт. **Серэнгеці**. Антылопы гну ў рэзерваце Нгарангора.

СЕСТЭ́РЦЫЙ (ад лац. sestertius), сярэбраная і медная манета, а таксама грашова-лікавае паняцце ў Стараж. Риме. З 269 да н.э. чаканіўся з серабра, з канца 1 ст. да н.э. — са сплаву каляровых металаў. Адзнака наміналу — IIS /

2 $^{1}/_{2}$ аса, ас — спачатку $^{1}/_{10}$, з 217 да н.э. $^{1}/_{16}$ *дэнарыя*). На Беларусі выяўлены медныя С.

СЕТ, С е т х, у старажытнаегіпецкай рэлігіі і міфалогіі адзін з гал. багоў. Бог «чужых краін» (пустынь), цемры і зла, брат і забойца «добрага бога» *Асірыса*. У перыяд Стараж. царства (28—23 ст. да н.э.) лічыўся таксама апекуном царскай улады. Паводле міфаў, С. быў пераможаны сынам Асірыса богам *Горам*, які адпомсціў за бацьку і сам стаў уладаром Сусвету.

СЕ́ТАН-ТО́МПСАН (Seton-Thompson) Эрнест (14.8.1860, г. Саўт-Шылдс, Вялікабрытанія — 23.10.1946), канадскі пісьменнік, прыродазнавец, мастак-анімаліст. Скончыў каледж мастацтваў у Таронта (1879), вывучаў выяўл. мастацтва ў Парыжы, Лондане, Нью-Йорку. Падарожнічаў, даследаваў жыццё жывёл. Арганізатар руху следапытаў у Амерыцы. Друкаваўся з 1883. Пісаў на англ. мове. Аўтар больш як 40 кніг пра жывёльны свет, індзейскую і эскімоскую нар. культуру. Вядомасць прынеслі праца «Жыццё дзікіх жывёл» (т. 1—8, 1925—27) і блізкія да навук.-папулярнай л-ры аповесці, апавяданні, нарысы «Дзікія жывёлы, як я іх ведаў» (1898), «Біяграфія грызлі» (1900), «Жыцці тых, на каго палююць» (1901), «Два малыя дзікуны» (1903), «Героі-жывёлы» (1906), «Біяграфія серабрыстага ліса» (1909), «Рольф сярод лясоў» (1911), «Кніга аб лесе» (1912) і інш. Аўтар маст. аўтабіяграфіі «След мастака-натураліста» (1940). Сам ілюстраваў свае кнігі.

Тв.: Бел. пер. — Гісторыя аднаго мядзведзя. Мн., 1927; Лепш смерць, чым няволя. Мн., 1928; Рванае вушка. Мн., 1939; Рус. пер. — Рассказы о животных. Мн., 1980; Прерии Арктики... М., 1987; Моя жизнь; Маленькие дикари; Рассказы о животных. М., 1991; Приключения Рольфа. М., 1993; Лесные рассказы. СПб., 1994. *Л.П.Баршчэўскі.*

СЕ́ТАЎСКАЕ ВО́ЗЕРА, С е т ы, возера ў Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дабрылаўка, за 11 км на Пн ад г. Глыбокае. Пл. 0,49 км^2, даўж. 1,7 км, найб. шыр. 410 м, найб. глыб. 19,8 м, даўж. берагавой лініі 4,9 км. Пл. вадазбору 4,7 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы выш. 2—5 м (на З і Пд 10—27 м), разараныя, часткова пад хмызняком, на ПдЗ пад лесам. На З, ПнЗ і ПнУ пойма шыр. 3—50 м. Берагі нізкія, пясчаныя, задзернаваныя. Ёсць залівы і паўастравы. Падводная ч. катлавіны мае 2 плёсы, раздзеленыя падняццем з глыб. 6 м. Мелкаводдзе пясчанае, глыбей дно ілістае. Зарастае. Злучана канавай з воз. Загорскае.

СЕ́ТКА (лац. Reticulum), невялікае сузор'е Паўд. паўшар'я неба. Найб. яркая зорка 3,3 візуальнай *зорнай велічыні*. Гл. *Зорнае неба*.

СЕ́ТКАВАЕ ПЛАНАВА́ННЕ, метад планавання, кантролю і рэгулявання вытв. дзейнасці, засн. на выкарыстанні графічнай мадэлі вытв. працэсу (сеткавага графіка). Дае магчымасць выявіць сувязь паміж асобнымі тэхнал. аперацыямі, паслядоўнасць і залежнасць работ, час іх выкарыстання і г.д. Выкарыстоўваецца пры буд-ве і рэканструкцыі аб'ектаў, у праектна-канструктарскіх і н.-д. работах, арганізацыі выпуску новых відаў прамысл. прадукцыі і г.д. Упершыню пачаў прымяняцца ў ЗША.

СЕТКАКРЫ́ЛЫЯ (Neuroptera, або Planipennia), атрад насякомых. Каля 5 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя Антарктыды. Вядомы з пермскага перыяду. На Беларусі найб. адзначаюцца прадстаўнікі сям. *залатавочак* і *мурашыных ільвоў*.

Даўж. цела 1—3 см, размах крылаў да 12 см. Цела тонкае, светла-зялёнае, чорнае і інш. Крылаў 2 пары, звычайна аднолькавых, празрыстых сеткавых (адсюль назва). Ротавы апарат грызучага тыпу. Ногі тонкія, хадзільныя, з 5-члянікавымі лапкамі, у некат. відаў пярэднія — капальныя. Развіццё з поўным ператварэннем. У лічынак сківіцы ўтвараюць смактальныя трубкі. Многім з іх уласціва пазакішачнае страваванне (у цела ахвяры ўводзяць стрававальныя ферменты, потым высмоктваюць ператраўленую ежу). Карысныя: кормяцца тлёй, какцыдамі і інш. насякомымі, шкоднымі для сельскай і лясной гаспадарак.

СЕТЛЬМЕ́НТ (англ. settlement паселішча), у перыяд каланіялізму асобы раён горада (звычайна ў паўкаланіяльнай краіне, як, напр., Кітай) для пражывання замежных грамадзян, які не падлягаў юрысдыкцыі мясц. улад.

СЕТУ́БАЛ (Setúbal), горад на З Партугаліі. Адм. ц. аднайм. акругі. Каля 100 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт пры ўпадзенні р. Саду ў Атл. акіян. Цэнтр рыбалоўства і рыбаконсервавай прам-сці. Развіты матора- і суднабудаванне, вытв-сць фосфарных угнаенняў, апрацоўка кары коркавага дуба, вінаробства. Музей. Руіны стараж.-рым. горада, касцёлы 15—16 ст.

СЕТЫ́Ф, С а т ы ф, горад на ПнУ Алжыра. Адм. ц. аднайм. вілайі. Засн. ў 1 ст. да н.э. як рым. ваен. паселішча. Каля 200 тыс. ж. (2001). Вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: харч., цэм., хімічная. Дыванаткацтва. Ун-т.

СЕ́ТЭРЫ (англ. setter ад set рабіць стойку), пароды паляўнічых сабак-выжлаў. Выкарыстоўваюць для паляванне на птушак.

Канстытуцыя моцная, сухая. Вядомы 3 пароды С.: а н г л і й с к і (рабы або лаверак), выведзены ў Англіі; выш. ў карку 52—65 см, поўсць густая, бліскучая, доўгая, белая з чорнымі, рыжымі або карычневымі плямамі; і р л а н д с к і (чырвоны), выведзены ў Ірландыі; выш. ў карку 54—65 см, поўсць густая, сярэдняй даўжыні, цёмна-чырв.-рыжая; ш а т л а н д с к і (гардон), выведзены ў Шатландыі: выш. ў карку 58—67 см, поўсць гладкая або хвалістая, чорная з бліскучым адценнем, з яркімі рыжа-чырв. падпалінамі. Маюць добры нюх і прыроджаную здольнасць рабіць стойку перад затоенай дзічынай. Тып паводзін ураўнаважаны, рухомы.

СЕ́ЎЛ, горад, сталіца Рэспублікі Карэя (Паўд. Карэя). Вылучаны ў самастойную адм. адзінку, прыраўнаваную да правінцыі. Адзін з найбуйн. гарадоў свету. 9888 тыс. ж., з прыгарадамі і суседнімі гарадамі 19,85 млн. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Порт на р. Ханган, за 90 км ад зал. Канхваман Жоўтага м. (авангорт С. — г. *Інчхон*). 2 міжнар. аэрапорты. Гал. эканам. і культ. цэнтр краіны. Разам з Інчхонам дае каля 50% прамысл. вытв-сці Паўд. Карэі. У С. знаходзяцца асн. фінансавыя і пра-

Сетэры: 1 — ірландскі; 2 — англійскі; 3 — шатландскі.

мысл. аб'яднанні, страхавыя і гандл. кампаніі, банкі, філіялы замежных банкаў і фірм. Прам-сць: металургічная, аўтамабілебудаванне, эл.-тэхн., радыёэлектронная, хім., тэкст. (пераважна баваўняная), харч., буд. матэрыялаў, гумавая, гарбарная, паліграф., папяровая, керамічная. Буйныя ЦЭС. Метрапалітэн (больш за 1 млрд. пасажыраў штогод). 18 ун-таў. Нац. АН.

Першыя паселішчы на тэр. сучаснага С. вядомы з часоў 3 царстваў — *Кагуро, Пэкчэ, Сіла* (1—7 ст.). У 554 заваяваны Сілай і названы Хансон (ужываецца і цяпер як другая назва С.). З 1068 адзін з каралеўскіх гарадоў-рэзідэнцый. Пры дынастыі *Лі* [1392—1910] стаў сталіцай Карэі (1393), пераназваны С. (з карэйскай — сталіца) і пачаў хутка развівацца. У час *Імдзінскай вайны 1592—98* акупіраваны (1592—93) яп. войскамі. Пасля анексіі Карэі Японіяй С. — рэзідэнцыя яп. ген.-губернатара (1910—45; наз. Кёнджо), адзін з цэнтраў нац.-вызв. руху. Тут пачалося антыяп. *Сакавіцкае паўстанне 1919*. З 1948 сталіца Рэспублікі Карэя. Моцна разбураны ў час *карэйскай вайны 1950—53*, адбудаваны. У 1988 месца правядзення XXIV Алімп. гульняў.

Аблічча С. вызначаецца спалучэннем традыц. забудовы з сучаснымі вышыннымі будынкамі і арх. комплексамі. Цэнтр мае рэгулярную планіроўку, забудаваны шматпавярховымі дамамі, у паўд. і ўсх. частках пераважаюць кварталы з вузкімі крывымі вуліцамі. У С. існаваў вял. ансамбль палаца Кёнбакун са шматлікімі парадными і жылымі будынкамі, адасобленымі дварамі і паркамі (1395, зруйнаваны ў 1592, адноўлены ў 19 ст., у 1950—53 зноў разбураны; захаваўся фрагментарна). Помнікі архітэктуры: пагады 3-ярусная Ханмётхап храма Пакчонса (1085) і храма Вангакса (1464), крапасная сцяна Ханьянсон (1392—1446, захавалася часткова) з варотамі Намдэмун (1395) і Тандэмун (1396), палацы Чхандок (1404, зруйнаваны ў 1592, адноўлены ў 17 ст.), Чангён (15—17 ст.), Даксу (16 ст.), у ансамблі якога палац Сакджаджон (1901—11; цяпер будынак Нац. музея) і інш. Сярод сучасных збудаванняў спарт. комплекс, пабудаваны да XXIV Алімп. гульняў. У С. шмат паркаў, садоў, у т.л. заал. і бат., 15 мастоў. Музеі: выяўл. мастацтваў, кар. мастацтва, фальклору, тэхнікі фірмы «*Самсунг*», скансэн. Тэатры: оперы, народны, Усходу; сімф. аркестры.

В.У.Адзярыха (гісторыя).

СЕЎР (Sèvres), горад у Францыі, паўд.-зах. прыгарад Парыжа. Каля 25 тыс. ж. (2001). Вытв-сць маст. вырабаў з фарфору (з 1756), т.зв. *сеўрскі фарфор*, Нац. музей керамікі. Міжнар. бюро мер і вагі. Месца заключэння *Сеўрскага мірнага дагавора 1920*.

СЕЎРСКІ МІРНЫ ДАГАВОР 1920. Падпісаны саюзнымі дзяржавамі-пераможцамі ў 1-й сусв. вайне 1914—18 [Вялікабрытаніяй, Францыяй, Італіяй, Японіяй, Бельгіяй, Грэцыяй, Польшчай, Партугаліяй, Румыніяй, Каралеўствам сербаў, харватаў і славенцаў, Хіджазам (Саудаўская Аравія), Чэхаславакіяй і Арменіяй] з Турцыяй 10 жн. ў г. *Сеўр*. Быў ч. *Версальска-Вашынгтонскай сістэмы*. Афарміў падзел *Асманскай імперыі*, у т.л. расчляненне ўласна тур. тэрыторыі. Паводле ўмоў дагавора Сірыя і Ліван перадаваліся Францыі, Палесціна і Ірак — Вялікабрытаніі як *мандатныя тэрыторыі*. Турцыя адмаўлялася ад прэтэнзій на Аравійскі п-аў і краіны Паўн. Афрыкі, прызнавала пратэктарат Вялікабрытаніі над Егіптам, англ. анексію в-ва Кіпр. Усх. Фракія, Галіпальскі п-аў, раён Ізміра перадаваліся Грэцыі, а-вы Дадэканес — Італіі, Чарнаморскія пралівы дэмілітарызаваліся і пераходзілі пад кантроль новаўтворнай міжнар. Камісіі праліваў. Прадугледжвалася стварэнне незалежнай дзяржавы *Курдыстан* (не адбылося). Дагаворам абмежаваны тур. ўзбр. сілы (50 тыс. чал.). Урад Вял. нац. сходу Турцыі адхіліў С.м.д. На *Лазанскай канферэнцыі 1922—23* Турцыя дамаглася замены яго *Лазанскім мірным дагаворам 1923*.

Сеул. Палацава-паркавы ансамбль Кёнбакун. Фрагмент.

СЕЎРСКІ ФАРФО́Р, мастацкія вырабы фарфаравага завода ў г. Сеўр (Францыя). Засн. ў г. Венсен (1740). У Сеўр вытв-сць пераведзена ў 1756. Першыя вырабы зроблены пад метал. формы і з уплывам *майсенскага фарфору*. Першыя майстры — жывапісец Ж.Ж.Башэлье і хімік Ж.Эло (вынаходнік унікальнай сіняй фарбы, адной з адметных рыс С.ф.). Размалёўкі на ярка-сінім, бірузовым і белым фонах уяўлялі сабой натуралістычныя выявы кветак, гірлянд, птушак, пейзажаў. У сярэдзіне 18 ст. быў пашыраны ружовы фон ракайлевых размалёвак золатам і *шынуазры*. Характэрны элемент С.ф. — размалёўкі пад *камеі* ў манахромнай тэхніцы *грызайль*. У 1770—1830-я г. С.ф. вырабляўся ў стылі класіцызму; былі пашыраны міфалагічныя і жанравыя скульптурныя групы, партрэтныя медальёны і бюсты, рэльефныя плакеткі (белым па сінім фоне), якія выкарыстоўваліся ў якасці ўставак у мэблю. Да 1800 вырабы (сервізы, вазы) ствараліся пераважна з мяккага фарфору (без кааліну), абпаленага пры параўнальна невысокай тэмпературы, што дазваляла дасягаць сакавітасці і вытанчанасці дробнага дэкору. З больш моцнага бісквіту ствралі групы і фігуры па мадэлях Э.М.Фальканэ, Л.С.Буазо, Ж.Б.Пігаля, Э.Бушардона, Кладыёна. З 1772 рабілі цвёрды фарфор. У 20 ст. ў стварэнні вырабаў С.ф. ўдзельнічалі вядучыя мастакі (Ж.Люрса і інш.).

Сеўрскі фарфор. Марожаніца з сервіза з камеямі. 1778.

Літ.: Бирюкова Н.Ю. Французская фарфоровая пластика XVIII в. Л., 1962.

Я.Ф.Шунейка.

СЕЎРУК Міхаіл Канстанцінавіч (27.2.1905, Варшава — 14.3.1979), бел. жывапісец і графік. Скончыў маст. ф-т Віленскага ун-та (1932, вучыўся ў *Ф.Рушчыца, Л.Сляндзінскага*). Адзін з арганізатараў Віленскага т-ва мастакоў. З 1939 жыў у Нясвіжы. Раннім работам уласцівы рысы рамантызму. Пазнейшыя творы вылучаюцца народнасцю вобразаў, скульпт. аб'ёмнасцю форм, дасканалым малюнкам. Сярод жывапісных твораў: тэматычныя кампазіцыі «На ўборцы бураковў» (1936), «Жніво» (1937), «Ля студні», «Стрыжка авечак» (абедзве 1939), «На сенажаці» (1953), «Збор ураджаю» (1962), «Гутарка» (1965), «Новы дом» (1968), «Дзяўчаты» (1969), «У садзе» (1971), «Гаспадынька» (1975), «Успаміны» (1976), «Вяртанне з поля» (1978); пейзажы «Зімовая раніца» (1961), «Стары шлях», «Ліпы ў Альбе» (1970); партрэты «Папрадуха» (1930-я г.), «Стары з кіем» (1940), «Маці» (1962), «Аўтапартрэт» (1969), «Жняя» (1974), нар. артысткі БССР Л.Давідовіч (1975); нацюрморты «Нацюрморт з лотацямі» (1971), «Нацюрморт з газетай» (1973). Аўтар вокладак зб-каў вершаў М.Танка «На этапах» (1936) і песень Р.Шырмы «Наша песня» (1938), графічных работ «Хата

над Вілейкай», «Віленская Alma mater» (абедзве 1937), «Вяртанне з працы», «Лета» (абедзве 1938), «Партрэт партызана» (1945), «Слуцкая брама ў Нясвіжы» (1958) і інш. У 1994 у Нясвіжы створана «музей-кватэра» С.

Літ.: М.К.Сеўрук: [Фотаальбом]. Мн., 1980. *Л.У.Салоджіна, М.М.Купава.*

СЕ́ЎРУК Уладзімір Мікалаевіч (н. 6.6.1932, Мінск), бел. парт. і грамадскі дзеяч, літаратуразнавец, публіцыст, перакладчык. Канд. філал. н. (1967). Скончыў БДУ (1954), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1966). З 1954 на камсам., парт. і журналісцкай рабоце ў Мінску, Магадане. З 1966 у апараце ЦК КПСС. У 1980—88 каардынатар саветніцкай дзейнасці КПСС па пытаннях ідэалогіі, навукі, культуры, адукацыі ў Афганістане. У 1988—91 першы нам. рэдактара газ. «Известия», рэдактар газ. «Неделя». З 1993 заг. аддзела ў ін-це «Белінфармпрагноз», з 1995 нам. дырэктара Бел. нац. прэс-цэнтра, заг. аддзела Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з 1998 памочнік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. Складальнік зб-каў гісторыка-літ. публіцыстыкі «Як канчаюцца войны» (1968), «Масква—Сталінград» (1970), «Моладзь ідзе ў рэвалюцыю» (1973), «Пароль: Перамога!» (т. 1—2, 1985) і інш. Напісаў сцэнарыі дакумент.-маст. фільмаў пра падзеі ў Афганістане (1979—85) «Праўда красавіцкай рэвалюцыі» (1981; прэмія Ленінскага камсамола 1981) і «Сцяг красавіцкай рэвалюцыі» (1985). Перакладае на рус. мову творы бел. пісьменнікаў.

М.Сеўрук. Новы дом. 1968.

СЕ́ЎРУКО́Ў Мікалай Іванавіч (н. 28.6.1947, г. Дальні, Кітай), бел. баяніст, педагог. Засл. арт. Беларусі (1983). Праф. (1990). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1971). З 1966 выкладчык муз. школы ў Ленінградзе, з 1972 — Мінскага муз. вучылішча імя М.Глінкі, з 1973 саліст Бел. філармоніі, адначасова выкладчык Бел. акадэміі музыкі (з 1981 заг. кафедры). Яго выканальніцкі стыль адметны глыбокім пранікненнем у аўтарскую задуму, віртуозным валоданнем інструментам, раскрываючы яго тэхн. і тэмбравыя магчымасці. У рэпертуары творы кампазітараў-класікаў (у пералажэннях) і сучасных аўтараў, у т.л. бел. Я.Глебава, В.Войціка, В.Іванова, В.Помазава, Л.Шлег і інш. Лаўрэат Міжнар. конкурсу баяністаў у ГДР (1971). Пра творчасць С. зняты тэлефільм «Іграе Мікола Сеўрукоў». Сярод вучняў Б.Біёчыч, Г.Вінаградскі, І.Квашэвіч, А.Мацкевіч, Н.Слюсар, Ю.Тарасёнак. *І.М.Шмелькіна.*

СЕЎЦАПАДО́БНЫЯ (Charadriiformes), атрад птушак, 3 падатр.: *кулікі* (14 сям., каля 180 відаў), *чайкі* (4 сям., каля 100 відаў), чысцікі (1 сям., 22 віды). Вядомы з позняга мелавога перыяду. Пашыраны ўсюды, акрамя Антарктыды. Жывуць пераважна на ўзбярэжжах і астравах вадаёмаў, балотах і сенажацях, трапляюцца на палях. На Беларусі 57 відаў. Найб. пашыраны чайка азёрная (Larus ridibundus), *кнігаўка, слонка, бакас.* 13 відаў у Чырв. кнізе Беларусі: *аўдотка, гаршнэп, паручайнік, сявец залацісты, чорнаваллёвік*, крачка малая (гл. *Крачкі*), *кулік-сарока, кулоны*, уліт вялікі (гл. *Улітовыя*), чаркушка стэпавая (гл. *Ціркушкавыя*), чайкі малая і серабрыстая. У Чырв. кнізе МСАП 14 відаў, 3 падвіды.

Маса птушак ад 20 г (*кулік-верабей*) да 1 кг і больш (кулон). Апярэнне шчыльнае, няяркае, зверху часцей цямнейшае. Ногі доўгія. Дзюба часцей доўгая, вострая, прамая або загнутая. Крылы вузкія, доўгія. Хвост кароткі. Вывадкавыя і паўвывадкавыя птушкі. У кладцы да 5 яец. Кормяцца беспазваночнымі, рыбай, дробнымі земнаводнымі і млекакормячымі, насеннем раслін. Асобныя — аб'екты палявання.

СЕ́ЎЧАНКА Антон Нічыпаравіч (22.2.1903, в. Дзяніскавічы Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. — 26.9.1978), бел. фізік, заснавальнік навук. школ па спектраскапіі злучэнняў шасцівалентнага урану і фотафізіцы біялагічна важных пігментаў. Акад. АН Беларусі (1953), д-р фіз.-матэм. н., праф. (1953). Герой Сац. Працы (1971). Засл. дз. нав. Беларусі (1967). Скончыў БДУ (1932). З 1934 у Дзярж. аптычным ін-це (Ленінград). З 1953 заг.

А.Н.Сеўчанка.

сектара фізікі і матэматыкі Фіз.-тэхн. ін-та, з 1955 дырэктар Ін-та фізікі і матэматыкі АН Беларусі. З 1957 рэктар БДУ, з 1972 дырэктар НДІ прыкладных фіз. праблем, цяпер НДІ прыкладных фіз. праблем імя А.Н.Сеўчанкі пры БДУ. У 1956—73 чл. Прэзідыума АН Беларусі. Навук. працы па спектраскапіі уранілавых злучэнняў, люмінесцэнцыі злучэнняў рэдказямельных элементаў, спектраскапіі і фотахіміі парфірынаў і інш. біялагічна важных пігментаў. Выявіў палярызацыю флуарэсцэнцыі уранілавых злучэнняў, расшыфраваў складаную структуру іх спектраў. Устанавіў заканамернасці люмінесцэнцыі комплексаў рэдказямельных элементаў і ўнутрыкомплекснай міграцыі энергіі. Вывучыў спектральна-палярызацыйныя ўласцівасці люмінесцэнцыі парфірынаў і металапарфірынаў у сувязі з сіметрыяй іх малекул, анізатрапію спантаннага і вымушанага выпрамянення растворaў арган. злучэнняў.

Тв.: Спектроскопия хлорофилла и родственных соединений. Мн., 1968 (разам з Г.П.Гурыновічам, К.М.Салаўёвым); Анизотропия поглощения и испускания света молекулами. Мн., 1971 (разам з А.М.Саржэўскім).

Літ.: А.Н.Севченко: Библиогр. указ. Мн., 1983.

СЕФЕВІ́ДАЎ ДЗЯРЖА́ВА, дзяржава на Сярэднім Усходзе ў 1502—1736 на чале з дынастыяй *Сефевідаў*, якая дала пачатак сучаснай іранскай дзяржаве. Створана ў выніку паўстання азерб. плямён, якія ў 1499 узначаліў шэйх суфійскага брацтва *Сефевіе* Ісмаіл. Паўстанцы нанеслі паражэнне дзяржаве Ак-Каюнлу, што размяшчалася на тэр. Зах. Ірана і Ірака, і ў 1502 Ісмаіл абвешчаны шахам (гл. *Ісмаіл I*). Дзярж. рэлігіяй С.дз. стаў *шыізм*. Апорай першых Сефевідаў былі цюркскія азерб. плямёны кызылбашаў («чырвонагаловыя»), а цэнтр. вобласцю — Азербайджан, дзе знаходзілася сталіца С.дз. — напачатку Тэбрыз, з 1548 — Казвін. Пасля смерці Тахмаспа I [1524—76] міжусобіцы прывялі да фактычнага распаду С.дз. Яе аб'яднаў *Абас I* Вялікі [1587—1629]. Ён разбіў туркаў і ўзбекаў, вярнуў страчаныя тэрыторыі (Харасан, Азербайджан), завая-

ваў Ірак. Пры ім адбылася персізацыя дзяржавы, сталіца перанесена ў Ісфахан. У выніку адм., ваен. і інш. рэформ С.дз. ўмацавалася, што спрыяла яе эканам. і культ. росквіту на працягу амаль усяго 17 ст. Але хуткі рост насельніцтва прывёў у канцы 17 ст. да збяднення нар. мас. Пры шаху Султане Хусейне [1694—1722] сац.-эканам. крызіс паглыбіла паўстанне афганцаў, якія ў 1722 захапілі Ісхафан, а туркі — Азербайджан. Барацьбу супраць афганцаў і туркаў узначаліў палкаводзец *Надзір-шах*, які ў 1736 адхіліў ад улады апошняга сефевідскага шаха Абаса III [1732—1736].

Літ.: Эфендиев О.А. Азербайджанское государство Сефевидов в XVI в. Баку, 1981; Павлова И.К. Хроника времен Сефевидов: Сочинение Мухаммад-Масума Исфахани «Хуласат ас-сийар». М., 1993.

СЕФЕВІ́ДЫ, дынастыя правіцеляў дзяржавы на Блізкім і Сярэднім Усходзе ў 1502—1736. Паходзілі з азерб. шэйхаў суфійскага брацтва (тарыката) *Сефевіе* (13—15 ст..), потым шахаў *Сефевідаў дзяржавы* (1502—1736), стваральнікаў сучаснай іранскай дзяржавы. Шахі С.: Ісмаіл I [1502—24], Тахмасп I [1524—76], Ісмаіл II [1576—77], Мухамед Худабендэ [1578—87], *Абас I* Вялікі [1587—1629], Сефі I [1629—42], Абас II [1642—66], Сулейман [1666—94], Султан Хусейн [1694—1722], Тахмасп II [1722—32], Абас III [1732—36].

СЕФЕВІ́Е, Сефевія, суфійскае брацтва (тарыкат), якое заснаваў у канцы 13 ст. Сефі ад-дзін Ісхак (1252—1334). У 15 ст. кіраўнікі С. ператварыліся ў правіцеляў (шэйхаў) г. Ардэбіль (Іранскі Азербайджан). У 1499 шэйх Ісмаіл (гл. *Ісмаіл I*) пад лозунгамі *шыізму* пачаў барацьбу супраць правіцеляў-сунітаў з дзяржавы Ак-Каюнлу, якая скончылася яго перамогай і стварэннем *Сефевідаў дзяржавы*.

СЕФЕ́РЫС (Seferis; сапр. Сефериядыс; Sepheriadēs) Гіоргас (19.2.1900, г. Ізмір, Турцыя — 20.9.1971), грэчаскі пісьменнік, дыпламат; адзін з пачынальнікаў інтэлектуальнай плыні ў сучаснай навагрэч. паэзіі. Вучыўся ў Афінах і Парыжы (1914—25). У 1926—41, 1946—62 на дыпламат. службе. Друкаваўся з 1931. У ранніх зб-ках паэзіі «Паварот» (1931), «Вадаём» (1932), паэме «Легенды» (1935) уплывы неарамантызму; у зб-ках вершаў і паэм «Міфгісторыя» (1935), «Гімнапедыя» (1936), «Сшытак практыкаванняў» (1940), «Карабельныя дзённікі» (т. 1—3, 1940—55), «Кіхлі» (1947), «Кіпр, край майго праротва» (1955), «Тры шчырыя паэмы» (1966) і інш. уплывы франц. паэтаў-сімвалістаў і Т.С.*Эліята*, перапляценне інтэрпрэтацыі стараж.-грэч. міфаў з роздумам пра цяперашні лёс суайчыннікаў, найперш інтэлектуалаў. Аўтар эсэ, у т.л. «Пра іншаземны верш» (1932), «Дыялог пра паэзію» (1939), «Спробы» (1944), «Мова нашай паэзіі» (1965), дарожных нататак «Тры дні ў манастырах Кападокіі» (1953), рамана «Шэсць начэй на Акропалі» (апубл. 1976), дзённікаў і інш. Нобелеўская прэмія 1963.

Тв.: Рус. пер. — у кн.: Геракл и мы: Современная греч. поэзия. М., 1983; У кн.: Поэты-лауреаты Нобелевской премии. М., 1997.

Л.П.Баршчэўскі.

Г.**Сеферыс**.

І.М.**Сечанаў**.

СЕФІДРУ́Д, рака ў Іране, назва ніжняга цячэння р. *Кызылузен*.

СЕ́ХМЕТ, Сахмет («магутная»), у старажытнаегіпецкай рэлігіі і міфалогіі багіня вайны і пякучага сонца. Яе ўяўлялі жанчынай з галавой ільвіцы (свяшчэнная жывёла С.). Цэнтр культу — г. Мемфіс. Паводле міфаў, С. — дачка *Ра* (яго грознае вока), жонка Птаха (бог г. Мемфіс), маці Нефертума (бог расліннасці). Яна знішчае ворагаў Ра і *Асірыса*, а ў міфе аб пакаранні богам Ра чалавечага роду за грахі вынішчае людзей. Разам з тым лічылася багіняй-лекаркай і апякункай урачоў.

СЕ ХЭ, кітайскі жывапісец і тэарэтык 5 ст. Аўтар трактата «Катэгорыі класічнага жывапісу», у якім акрэсліў 6 правіл пабудовы жывапіснага твора: рытм душы — рух жыцця; валоданне малюнкам, валоданне пэндзлем; адпаведнасць з аб'ектам, дасягненне знешняга падабенства; увядзенне фарбаў у адпаведнасці з натурай; увядзенне парадку, размеркаванне мас; выкарыстанне традыцый, прапрацоўка ўзораў. Працаваў у жанры «людзі». Творы не захаваліся.

СЕЦЭСІЁН (ням. Sezession ад лац. secessio аддзяленне), 1) назва стылю *мадэрн* у Аўстрыі і краінах, якія ўваходзілі ў Аўстра-Венгерскую імперыю. 2) Аб'яднанні мастакоў, архітэктараў і дызайнераў у Мюнхене, Берліне (з 1892), Вене (з 1897), якія супрацьпастаўлялі сваё мастацтва *акадэмізму*. У С. уваходзілі О.*Вагнер*, Г.*Клімт*, І.Гофман, К.Мозер, Э.Орлік і інш.

СЕ́ЦЯЛЯ (Setälä) Эміль Нестар (27.2.1864, г. Кокемякі, Фінляндыя — 8.2.1935), фінскі мовазнавец, дзярж. дзеяч; заснавальнік фіна-угорскага параўнальна-гіст. мовазнаўства. У 1913—14 прэзідэнт Фінл. акадэміі навук і л-ры, у 1893—1929 праф. Хельсінкскага ун-та. У 1925 міністр асветы, адначасова ў 1925—26 міністр замежных спраў Фінляндыі. З 1926 канцлер ун-та ў г. Турку. У 1888—90 ажыццявіў паездкі да ліваў, вотаў, вепсаў, вывучаў іх мовы і этнаграфію. Упершыню выкарыстаў метад аналогіі ў фіна-угразнаўстве. Распрацаваў транскрыпцыю для фіна-угорскіх моў. Вывучаў фальклор, гісторыю, этнаграфію фіна-угорскіх народаў.

СЕ́ЧАНАЎ Іван Міхайлавіч (13.8.1829, с. Сечанава Ніжагародскай вобл., Расія — 15.11.1905), расійскі фізіёлаг; заснавальнік расійскай фізіял. школы. Ганаровы акад. Пецярбургскай АН (1904, чл.-кар. 1869). Скончыў Маскоўскі ун-т (1856). У 1860—70 праф. Медыка-хірург. акадэміі ў Пецярбургу, з 1871 — Новарасійскага ў Адэсе, у 1876—88 Пецярбургскага, у 1891—1901 Маскоўскага ун-таў. Асн. працы па фізіялогіі нерв. дзейнасці. Адкрыў існаванне цэнтр. тармажэння ў нерв. сістэме (сечанаўскае тармажэнне), абгрунтаваў адзінства псіхічных і фізіял. з'яў, рэфлекторны характар складаных псіхічных рэакцый, падуладнасць псіхікі аб'ектыўнаму вывучэнню. Выявіў эфект сумацыі ў нерв. цэнтрах, адзначыў ролю рухаў і рухальных адчуванняў у пачуццёвым і разумовым пазнанні, аналізаваў прыроду мысліцельных працэсаў. Адкрыў перыяд. біяэлектрычныя з'явы ў нерв. сістэме, увёў паняцце сігнальнай рэгуляцыі нервова-псіхічнай дзейнасці. Стваральнік аб'ектыўнай псіхалогіі паводзін, заклаў асновы фізіялогіі працы, узроставай і эвалюц. фізіялогіі, прапанаваў ідэю «актыўнага адпачынку».

Тв.: Элементы мысли: Сб. избр. ст. М.; Л., 1943; Рефлексы головного мозга. М., 1952.

Літ.: Яновская М.И. Сеченов. М., 1959; Ярошевский М.Г. И.М. Сеченов, 1829—1905. Л., 1968.

СЕ́ЧНА, Сешня, рака ў Шумілінскім р-не Віцебскай вобл., правы прыток р. Зах. Дзвіна. Даўж. 21 км. Пл. вадазбору 166 км². Вышэйшае з Дабееўскага воз. за 500 м на ПдУ ад в. Ільінцы, вусце каля в. Ярашова. Рэчышча ад вытоку на працягу 7 км каналізаванае.

СЕ́ЧЭНЫ (Széchenyi) Іштван (21.9.1791, Вена — 8.4.1860), венгерскі паліт. і грамадскі дзеяч. Граф. У 1820—30-я г. кіраўнік барацьбы ліберальнага венг. дваранства за рэформы. Прыхільнік паступовых рэформ, праціўнік радыкальных дзеячаў венг. нац.-вызв. руху на чале з Л.*Кошутам*. У пач. *рэвалюцыі 1848—49 у Венгрыі* ўвайшоў ва ўрад Л.Бацяні як міністр шляхоў зносін (крас. 1848), але ў вер. 1848 адышоў ад паліт. дзейнасці. Выступаў супраць рэжыму, які ўсталяваўся ў Венгрыі пасля паражэння рэвалюцыі. Скончыў самагубствам.

СЕ́ЯЛКА, машына для высявання насення с.-г. і лясных культур, а таксама для ўнясення мінер. угнаенняў. Бываюць трактарныя (навясныя, паўнавясныя, прычапныя), конныя і ручныя.

Паводле спосабу сеяння адрозніваюць С.: радковыя — для высявання насення звычайным радковым, вузкарадковым, шырокарадковым і стужачным спосабамі; гнездавыя — для сяўбы групамі (гнёздамі); пункцірныя (дакладнага высявання) — для высявання на-

сення на аднолькавай адлегласці ў радку; пункцірна-гнездавыя — для размяшчэння насення гнёздамі на аднолькавай адлегласці; раскідныя — размяркоўваюць насенне траў і ўгнаенне па плошчы поля. Паводле прызначэння бываюць С.: для сяўбы збожжавых культур (у т.л. камбінаваныя зернетукавыя для адначасовага высявання асн. культуры, мінер. угнаенняў і падсявання насення траў); сяўбы прапашных культур (кукурузныя, цукровабураковыя, бавоўнавыя); ільняныя і агароднінныя; спец. прызначэння (лясныя, парніковыя, плодагадавальнікавыя і інш.). У раёнах з ветравой эрозіяй пашыраны камбінаваныя сеялкі-культыватары для сяўбы на глебах, апрацаваных безадвальнымі прыладамі. Пры сяўбе яны рыхляць глебу, падразаюць пустазелле, высяваюць мінер. ўгнаенні і прыкачваюць засеяныя радкі.

На Беларусі фірма «Лідаграпраммаш» выпускае разнастайныя С. для сяўбы збожжавых, зернебабовых і травяных культур, Брэсцкі электрамех. з-д — сеялкі СПУ-6 «Бярэсце» для сяўбы збожжавых культур і травасумесей.

В.М.Кандрацьеў.

СЕ́ЯНЕЦ, маладая расліна, атрыманая з насення ў пасяўным аддзяленні пладовага ці ляснога гадавальніка без перасадкі. С. пладовых раслін (1—2-гадовыя) выкарыстоўваюць у якасці прышчэпаў для размнажэння сартоў; часта іх наз. *дзічкамі*. С. лясных культур (1—3-гадовыя хвойных і 1—2-гадовыя лісцевых парод) выкарыстоўваюць як пасадачны матэрыял.

СЕ́ГУН (скарочаная назва ад яп. сейі тайсёгун літаральна — вялікі палкаводзец, які падпарадкоўвае варвараў), першапачаткова званне, якое надавалася камандуючым войскамі, што пасылаліся са стараж. сталіцы Японіі Кіёта (Хэяна) у 794—811 для заваявання народнасці эбісу (*айнаў*) у паўн.-ўсх. ч. в-ва Хонсю; у 1192—1867 — тытул ваен.-феад. правіцеляў Японіі, якія кіравалі ад імя імператара і паходзілі з дынастый *Мінамота* (1192—1333), *Асікага* [1335(1338)—1573], *Такугава* (1603—1867). Улада С. (*сёгунат*) скінута ў час рэвалюцыі 1867—68 (гл. *Мэйдзі ісін*).

СЁГУНА́Т, форма дзярж. улады ў Японіі ў 1192—1867, пры якой яп. імператары былі пазбаўлены ўсялякай улады, а фактычнымі правіцелямі Японіі з'яўляліся *сёгуны* з дынастый *Мінамота, Асікага* і *Такугава*. Адлюстроўваў інтарэсы саслоўя *самураяў*. Ліквідаваны ў час рэвалюцыі 1867—68 (гл. *Мэйдзі Ісін*).

Літ.: Мендрин В.М. История сегуната в Японии: (Нихон гайси): Пер. с яп. [Т.] 1—2. М.; СПб., 1999.

Сеялка: *1* — радковая англійскага вынаходніка Дж.Тула (пач. 18 ст.); 2 — пнеўматычная універсальная СПУ-6 «Бярэсце» (Брэсцкі электрамеханічны завод).





Сеялка: а — прычапная радковая зернятукавая (1 — гідрацыліндр для пад'ёму сашнікоў; 2 — бункер для насення і ўгнаенняў; 3 — высейвальнае прыстасаванне; 4 — падножная дошка; 5 — закладвальныя рабочыя органы; 6 — сашнікі; 7 — насеннеправоды); б — пнеўматычная універсальная (1 — вентылятар; 2 — інжэктарны шлюз; 3 — шахтавая труба; 4 — размеркавальнікі; 5 — насеннеправоды; 6 — бункер; 7 — дазіравальнае прыстасаванне; 8 і 9 — высявальныя лемяшы); в — сашнікі (1 і 2 — радковы і вузкарадковы двухдыскавыя; 3 — аднадыскавы; 4 — анкерны; 5 — кілепадобны).

794—811 для заваявання народнасці эбісу (*айнаў*) у паўн.-ўсх. ч. в-ва Хонсю; у 1192—1867 — тытул ваен.-феад. правіцеляў Японіі, якія кіравалі ад імя імператара і паходзілі з дынастый *Мінамота* (1192—1333), *Асікага* [1335(1338)—1573], *Такугава* (1603—1867). Улада С. (*сёгунат*) скінута ў час рэвалюцыі 1867—68 (гл. *Мэйдзі ісін*).

СЁДЭРБЛУМ (Söderblom) Натан (сапр. імя Ларс Олаф Іонатан; 15.1.1866, Трэнэ, Швецыя — 12.6.1931), шведскі рэлігійны і грамадскі дзеяч; стваральнік швед. школы рэлігіязнаўства. Доктар тэалогіі (1894). Чл. Шведскай акадэміі (з 1921). Скончыў Упсальскі ун-т (Швецыя). З 1892 пастар у лютэранскай царкве ў Парыжы. З 1901 заг. кафедры тэалогіі Упсальскага ун-та, у 1912—14 праф. гісторыі рэлігіі Лейпцыгскага ун-та. У 1914—31 архіепіскап Швецыі. У 1919 выступіў з ініцыятывай стварэння *Сусветнага савета цэркваў*. Арганізатар усеагульнай хрысц. канферэнцыі ў Стакгольме (1925), што аб'яднала лідэраў розных кірункаў хрысціянства і дало пачатак «практычнаму» хрысціянству, якое набыло арганізац. афармленне ў руху «Жыццё і дзейнасць». Нобелеўская прэмія міру 1930.

СЁДЭРСТРЭ́ЭМ (Söderström) Элізабет (н. 7.5.1927, Стакгольм), шведская спявачка (сапрана). З 1947 выступала ў Стакгольме ў зінгшпілях і аперэтах. З 1950 салістка Швед. каралеўскай оперы, у 1959—64 — «Метраполітэн-опера». З 1960-х г. выступала ў Вялікабрытаніі, у т.л. з 1967 у т-ры «Ковент-Гардэн». Выканаўца вядучых партый у операх В.А.Моцарта, Р.Штрауса, Дж.Пучыні, П.Чайкоўскага. У камерным рэпертуары значнае месца займае рус. вак. музыка, у т.л. рамансы С.Рахманінава. Аўтар кніг «У маім выкананні» (1978), «Песня ад Элізабет» (1986).

СЁМГА, лосось высакародны (Salmo salar), рыба сям. ласасёвых атр. ласосепадобных. Пашырана ў паўн. ч. Атл. ак., паўд.-зах. ч. Ледавітага ак. каля берагоў Еўропы і Паўн. Амерыкі. Існуе азёрная форма С. — азёрны ласось (S.s. morpha sebago) у буйных паўн. азёрах Лабрадор, Ладажскае, Анежскае і інш. На Беларусі да пабудовы на рэках плацін заходзіла на нераст з Балтыйскага м. ў рэкі Нёман, Зах. Дзвіна, Ві-

лія, Буг. Апошні раз назіралася ў р. Вілія (1954).

Даўж. цела да 1,5 м, маса да 39 кг. Луска дробная, серабрыстая. Перад нерастам цела цямнее, на баках і галаве паяўляюцца чорныя, чырв. і аранжавыя плямы, у самцоў падаўжаюцца і скрыўляюцца сківіцы. Скура на спіне патаўшчаецца. Плоднасць да 26 тыс. ікрынак. Ікра буйная, аранжавая. У рэкі заходзіць пераважна восенню. Моладзь жыве ў рэках да 5 гадоў, корміцца беспазваночнымі і дробнай рыбай, у моры — рыбай і ракападобнымі. Каштоўны аб'ект промыслу і развядзення.

Сёмга: 1 — самец у звычайным, 2 — у шлюбным убранні.

СЁМКАВА, вёска ў Папярнянскім с/с Мінскага р-на, на паўн.-ўсх. беразе Заслаўскага вадасховішча. Цэнтр саўгаса. За 16 км на ПнЗ ад Мінска, 12 км ад чыг. ст. Беларусь. 1461 ж., 482 двары (2001). Прадпрыемства па выт-сці дзіцячых цацак «Метэор». Сярэдняя школа, школа-інтэрнат, клуб, б-ка, аптэка, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — сядзіба (2-я пал. 18 ст.).

Вядома з 1567 як сяло, уласнасць Станіслававічаў, Саламярэцкіх, Рэкуцяў, Хмараў. У 1800 пры панскім двары на правым беразе Вячы мост, грэбля, млын, мураваны панскі дом, драўляная каталіцкая капліца, на левым беразе ракі — цагельны з-д. У 1897 у вёсцы 419 ж., 67 двароў, хлебазапасны магазін, карчма, у маёнтку 92 ж., 8 двароў. У 1917 у вёсцы 489 ж., у маёнтку — 115 жыхароў.

СЁМКАЎ ГАРАДО́К, вёска ў Папярнянскім с/с Мінскага р-на. За 14 км на ПнЗ ад Мінска. 171 ж., 73 двары (2001). Клуб. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік архітэктуры — касцёл Прасвятой Тройцы (2-я пал. 19 ст.).

Вядомы з сярэдзіны 16 ст. пад назвай Гарадок Саламярэцкі, уласнасць Саламярэцкіх. З 1595 у складзе маёнтка Сёмкава Мінскага пав., з 1755 уласнасць Хмараў, пры якіх пабудаваны касцёл. У 1791 у Заслаўскай парафіі. З 1793 у Рас. імперыі, мястэчка, цэнтр воласці. У 1800 у Гарадку Хмарыным 141 ж., 12 двароў, млын, корчмы, царква Раства Багародзіцы, дзе ў 1880-я г. вянчаліся бацькі М.*Багдановіча*. У 1861 тут 368 ж., 117 двароў, вал. ўправа, бровар, піва- і медаварні, цагельны з-д, царква, сінагога, у 1897 — 305 ж., 53 двары, царква, капліца, нар. вучылішча (адкрыта ў 1865), царк.-прыходская школа. У 1905—06 у маёнтку С.Г. працаваў Я.*Купала*, у крас.-маі 1922 — Я.*Колас*. У 1924—60 вёска, цэнтр сельсавета Заслаўскага р-на, з 1959 у Мінскім р-не. У Вял. Айч. вайну 27.6.1941 у ваколіцах С.Г. адбыліся жорсткія абарончыя баі.

А.І.Валаховіч.

СЁМКІН Аляксей Аляксандравіч (н. 23.9.1929, в. Крамянка Слаўгарадскага р-на, Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне фізіялогіі чалавека. Д-р біял. н. (1994), праф. (1996). Засл. работнік адукацыі Беларусі (1997). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1954). З 1957 у Акадэміі фіз. выхавання і спорту Беларусі (з 1977 рэктар, з 1985 дэкан, з 2000 заг. кафедры). Навуковыя працы па вывучэнні механізмаў адаптацыі арганізма да фіз. нагрузак і яго рэзервовых магчымасцей пад уздзеяннем спарт. дзейнасці.

Тв.: Физиологическая характеристика различных по структуре движения видов спорта. Мн., 1992; Механизмы моторной адаптации юношеского организма к скоростно-силовым упражнениям // Мир спорта. 2000. №1.

СЁМУХА, Тройца, зялёныя святкі, старажытнае земляробчае свята ў беларусаў і інш. славянскіх народаў. Лакальная назва зелянец. Святкавалася на сёмы (русальны) тыдзень пасля *Вялікадня*. Вытокі С. ў родавым грамадстве; у аснове яе культ зеляніны, шлюбу і продкаў. Пераходнае паміж веснавым і летнім земляробчымі цыкламі («На зелянец вясны канец»). Перад святам прыбіралі і ўпрыгожвалі хату і двор «маем» (аерам, галінкамі і дрэўцамі бярозы, клёну, рабіны, дубу і інш.), прыбіралі магілы. У суботу напярэдадні свята спраўлялі *дзяды*. Як пазнейшую з'яву трэба разглядаць асвячэнне ў нядзелю (1-ы дзень свята) у царкве лугавых і палявых зёлак, якія потым захоўваліся (у некаторых мясцовасцях імі абкурвалі нябожчыкаў, клалі іх у труну). Залежна ад мясц. традыцый на другі ці іншы дзень рабілі т.зв. «піва», кірмашы ці фэсты (прымяркоўваліся і да інш. свят), на якія збіраліся сваякі, нават далёкія. У час свята ў некаторых мясцовасцях адбывалася *кумаванне*, завівалі бярозку, ладзілі гульні, *карагоды*, потым агульнае частаванне, вілі вянкі. З вянкамі, «маем» звязаны ўяўленні, якія раней мелі характар магічных дзеянняў. На С. спявалі сёмушныя (траецкія) песні, асн. матывы якіх — каханне і шлюб (у паўд.-зах. раёнах спявалі яшчэ *куставыя песні*). На С., перад пачаткам летніх палявых работ, на Беларусі спраўлялі шмат вяселляў. Свята Тройцы ўведзена ў культавую практыку правасл. царквы ў 14 ст. Сергіем Раданежскім. Хоць С. і злілася з гэтым святам, яна захавала многія рысы язычніцтва і земляробчага культу.

А.В.Цітавец.

СЁМУХА Васіль Сяргеевіч (н. 18.1.1936, хутар Ясенец Пружанскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. перакладчык. Скончыў Маскоўскі ун-т (1959). Настаўнічаў, працаваў у Белдзяржвыдавецтве і выд-ве «Беларусь», у газ. «Літаратура і мастацтва», у 1972—97 у выд-ве «Мастацкая літаратура». Перакладае з ням., польскай, лат., укр. і інш. моў. Пераклаў кн. прозы ням. аўтараў В.Брэдэля «Ад Эбра да Волгі» (1959), Л.Рэна «Вайна без бітвы» (1962), Г. дэ Бройна «Прысуджэнне прэміі» (1977), Г.Гофэ «Фінальны акорд» (1979, з М.Навіцкім), Г.Фалады «Даўным-даўно ў нас дома» (1981), Т.Мана «Доктар Фаустус» (1989, Дзярж. прэмія Беларусі імя Я.Коласа 1992), Г.Гесэ «Гульня шкляных перлаў» (1992), Г.Грымельсгаўзена «Авантурнік Сімпліцысімус» (1997), кн. паэзіі І.В.Гётэ «Фауст» (1976), Р.М.Рыльке «Санеты Арфею» (1982), К.Маркса «Лірыка, 1836—1837» (1989), паэму Ф.Ніцшэ «Так сказаў Заратустра» (1994), з польскай мовы Ю.Тувіма «Польскія кветкі» (1984); з лат. мовы кн. лірыкі В.Бэлшэвіцы «Белы алень»

В.С.Сёмуха.

(1985), драму Я.Райніса «Агонь і ноч» (1988); з ісп. мовы зб. вершаў К.Шэрмана «Сны» (1989, з Р.Барадуліным), з рус. мовы кн. Ю.Лабынцава «Напой росою благодати...»: Малітоўная паэзія Кірылы Тураўскага» (1992). Пераклаў паасобныя творы А.Міцкевіча, М.Канапніцкай, Ю.І.Крашэўскага, Ц.Норвіда, В.Борхерта, І.Бехера, Г.Гейне, Ф.Фюмана, Э.Штрытматэра, В.Лаціса, А.Чака, А.Скалбе, І.Зіеданіса, М.Нага і інш. Выдаў зб. выбраных перакладаў «Прыйдзі, стваральны дух» (1986), пераклаў на бел. мову «Найвышэйшую песню Саламонаву» (1994), «Новы запавет. Псалтыр» (1995), «Біблію» (2002). Пераклаў для Нац. т-ра імя Я.Коласа драму Ф.Шылера «Марыя Сцюарт» (1968) і п'есу О'Ніла «Каханне пад вязамі» (1994), для Рэсп. т-ра бел. драматургіі трагіфарс Б.Брэхта «Узлёт Артура Уі, які можна было спыніць» (1997), для Мінскага абл. драм. т-ра ў Маладзечне п'есу Т.Дорста «Гер Паўль» (1998).

Літ.: Семяжон Я. Адкрыццё кантынента // Полымя. 1977. №8; Караткевіч У. І наш «Фауст» // Маладосць. 1978. №5; Рагойша В. Кантакты. Мн., 1982; Крупкіна Г. Мастацкі космас гётэўскага «Фаўста» і яго перастварэнне па-беларуску // Роднае слова. 2000. №7—10.

І.У.Саламевіч.

СЁМЫ З'ЕЗД КП(б)Б [XII канферэнцыя КП(б)Б]. Адбыўся 20—26.3.1923 у Мінску. Прысутнічалі 154 дэлегаты з рашаючым і 115 з дарадчым голасам ад 3850 чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: справаздачы ЦБ КП(б)Б (В.А.Багуцкі), Рэвіз. камісіі КП(б)Б (Л.М.Бунін), Кантрольнай камісіі (А.Х.Гетнер), ЦК КСМБ (М.Б.Кузенец); арганізацыя дзярж. прам-сці (А.С.Карпешын), нац. момант у дзярж. і парт. буд-ве (А.Р.Чарвякоў), падатковая палітыка ў вёсцы (В.А.Нодэль), аб кааперацыі (А.С.Сла-

вінскі), аб арганізац.-выхаваўчай рабоце (І.А.Вайнер); выбары кіруючых органаў і дэлегатаў на XII з'езд РКП(б). У ходзе з'езда ў парадак яго работы дадаткова ўключаны даклад ЦК РКП(б) (П.М.Кержанцаў).

З'езд ухваліў дзейнасць КП(б)Б ва ўмовах *новай эканамічнай палітыкі* (нэпа), адзначыў, што асновай пралетарскай дыктатуры з'яўляецца дзярж. прамысловасць, таму асн. ўвага павінна аддавацца развіццю цяжкай індустрыі, а лёгкая — павінна дапамагаць яе развіццю. Важнае месца адводзілася пашырэнню розных форм *кааперацыі*. З'езд выказаў задавальненне стварэннем СССР. Адзначалася, што хутка адрадзіць Беларусь можна толькі шляхам яе ўзбуйнення і перагляду існуючага адм. падзелу БССР, Віцебскай і Гомельскай губ., што неабходна прывесці яго ў адпаведнасць з натуральна-гіст., эканам., вытв. і нац.-культ. асаблівасцямі і далучыць да БССР тэрыторыі з большасцю бел. насельніцтва. Такую пазіцыю камуністаў Беларусі падтрымліваў І.В.Сталін і інш. члены ЦК РКП(б), супраць выступалі М.І.Калінін і шэраг партработнікаў Віцебскай і Гомельскай губ. З'езд звярнуў увагу на неабходнасць узмацнення класавага прынцыпу ў падаткаабкладанні. Былі акрэслены канкрэтныя мерапрыемствы па далейшым росце і ўмацаванні парт. і камсам. ячэек на прадпрыемствах, рэгуляванні сац. складу КП(б)Б, паляпшэнні ідэйна-выхаваўчай работы сярод камуністаў. Падкрэслівалася, што сакратары буйных ячэек на прадпрыемствах, у абласцях, саўгасах павінны быць вызвалены ад інш. работы. У дакументах з'езда праглядаюцца тэндэнцыі па стварэнні парт. бюракратыі, супярэчнасці паміж тэарэт. палажэннямі аб нэпе, якія распрацоўвалі У.І.Ленін і яго паплечнікі, і той палітыкай, што праводзілася камуністамі ў жыцці. З'езд выбраў ЦБ КП(б)Б з 13 чл. і 6 канд., Рэвіз. камісію КП(б)Б з 3 чл. і 3 канд., Кантрольную камісію з 5 чл. і 3 канд., 5 дэлегатаў на XII з'езд РКП(б).

Літ.: Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. Ч. 2 (1921—1966). Мн., 1967; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 1. Мн., 1983; Платонаў Р. Як пачалася беларусізацыя: Дыскусія на XII Усебел. парт. канф. // Роднае слова. 2000. №4.

В.Ф.Куцнер.

СЁМЫ УСЕБЕЛАРУ́СКІ З'ЕЗД САВЕ́ТАЎ рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Адбыўся 4—9.5.1925 у Мінску. Прысутнічала 525 дэлегатаў з рашаючым і 191 з дарадчым голасам. Парадак дня: справаздача ўрада БССР (Я.А.Адамовіч); аб развіцці сельскай гаспадаркі (Дз.Ф.Прышчэпаў); аб стане прам-сці ў БССР (А.Я.Калнін); аб сав. буд-ве (А.І.Хацкевіч); аб выкананні бюджэту 1924/25 і бюджэце на 1925/26 (Ф.А.Браўковіч); аб Чырв. Арміі (М.М.Тухачэўскі); аб медыцыне на вёсцы (М.І.Барсукоў); выбары ЦВК БССР, чл. Савета Нацыянальнасцей ЦВК СССР ад БССР і дэлегатаў на Усесаюзны з'езд Саветаў. З'езд ухваліў паліт. лінію ўрада Беларусі, адзначыў станоўчыя вынікі *ўзбуйнення БССР*, рост прам-сці, дасягненні ўрада ў арганізацыі дапамогі сялянству. Цэнтр. пытаннем на з'ездзе было абмеркаванне далейшых шляхоў развіцця сельскай гаспадаркі. У якасці першачарговай пастаўлена задача агульнага ўздыму сял. гаспадаркі, росту яе тавар-насці і інтэнсіўнасці. З'езд пацвердзіў ранейшы курс на дапамогу бядняцкім гаспадаркам. Дэлегаты падтрымалі палітыку *беларусізацыі*, але адзначалі недахоп беларускамоўнай л-ры, настаўнікаў бел. мовы, спецыялістаў-беларусаў з вышэйшай адукацыяй. Было разгледжана становішча бел. насельніцтва ў Зах. Беларусі. З'езд выбраў ЦВК БССР з 154 чл. і 49 канд., 5 прадстаўнікоў ад БССР у Савет Нацыянальнасцей ЦВК СССР, 47 дэлегатаў з рашаючым і 10 з дарадчым голасам на III Усесаюзны з'езд Саветаў.

Літ.: Стенографический отчет VII Всебелорусского съезда Советов. Мн., 1925; Резолюции VII Всебелорусского съезда Советов БССР. Мн., 1925.

І.Г.Яцкевіч.

СЁНЫ (Szönyi) Іштван (17.1.1894, г. Уйпешт, Венгрыя — 30.8.1960), венгерскі жывапісец і графік. Вучыўся ў Будапешцкай АМ (1914—22, з 1938 яе праф.) і ў Надзьбанье (Румынія). Творча пераасэнсоўваў прыёмы імпрэсіянізму і постімпрэсіянізму. Аўтар тонкіх па жывапісе і светлавых эфектах лір. пейзажаў і жанравых карцін: «На вяршыні гары» (1925), «Вечар у Забегене» (1928), «Баржы» (1937), «Капанне бульбы» (1949), «Перавозчык» (1951). Працаваў і ў галіне манум. мастацтва (размалёўка будынка пошты ў Будапешце, 1956). Прэмія імя Кошута 1949.

СЁРА́ (Seurat) Жорж П'ер (2.12.1859, Парыж — 29.3.1891), французскі жывапісец; заснавальнік *неаімпрэсіянізму*. Вучыўся ў Школе прыгожых мастацтваў у Парыжы (1878—79). Працаваў пераважна ў Парыжы. Сюжэты ранніх твораў блізкія традыцыям *барбізонскай школы*: сельскія віды і сяляне за працай. Пазней пад уплывам імпрэсіяністаў запазычыў у іх тэхніку і тэмы. Першы значны твор — «Купанне ў Аньеры» (1884). У карціне «Нядзеля пасля паўдня на востраве Гранд-Жат» (1886) упершыню выкарыстаў тэхніку *пуантылізму*. У творах імкнуўся стварыць «лагічную навуковую і жывапісную» сістэму, з дапамогай якой імкнуўся надаць карціне гармонію і ўзгодненасць колеру: «Парад» (1888), «Канкан» (1890), «Цырк» (1891). Пераважную большасць яго работ складаюць пейзажы, марскія віды, у якіх дакладныя натурныя назіранні спалучаюцца з рытмічнай кампазіцыяй: пейзажы Порт-ан-Бесена (1888), Кратуа (1889), Граўліна (1890). Яго маст. канцэпцыі паўплывалі на фавістаў, кубістаў, ням. экспрэсіяністаў і італьян. футурыстаў і інш.

Літ.: Ж.Сёра. П.Синьяк. Письма. Дневники..: Пер. с фр. М., 1976; Перрюшо А. Жизнь Сёра: Пер. с фр. М., 1992.

Я.Ф.Шунейка.

СЁРФІНГ (англ. surfing слізганне па хвалях), спаборніцтвы на скорасць, далёкасць перамяшчэння па вял. прыбойных хвалях на спец. коркавай або пенапластавай дошцы стоячы, без мацаванняў; адзін з водных відаў спорту.

Дошку робяць паводле індывідуальнага заказу, звычайна даўж. 1,8—2,3 м, масай 10—12,5 кг. Заплывы працягваюцца 15—25 мінут, фінальны — 30—45 мінут. Ацэнкі бальныя (ад 0,1 да 10). Пашыраны пераважна ў Аўстраліі, Новай Зеландыі, на Гавайскіх а-вах і ў прыморскіх раёнах ЗША, Інданезіі, Кітая і інш.

СІ (сістэма інтэрнацыянальная), скарочанае абазначэнне *Міжнароднай сістэмы адзінак*.

СІ (ад англ. літары С), універсальная *мова праграмавання* высокага ўзроўню. Распрацавана спачатку для пераносу *матэматычнага забеспячэння* з ЭВМ аднаго тыпу на ЭВМ інш. тыпаў. Пазнейшыя версіі (Ci^{+}, Ci^{++} і інш.) арыентаваны на рашэнне задач павышанай складанасці.

СІ́БАРГ (Seaborg) Глен Тэадор (19.4.1912, г. Ішпемінг, ЗША — 25.2.1999), амерыканскі хімік і фізік. Чл. Нац. АН ЗША (1948), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1958). Замежны чл. Рас. АН (1971) і АН інш. краін. Скончыў Каліфарнійскі ун-т у г. Берклі (1937), дзе і працаваў (з 1945 праф., у 1958—61 прэзідэнт ун-та). У 1942—46 удзельнічаў у стварэнні амер. атамнай бомбы. У 1954—61 і з 1972 нам. дырэктара Берклеўскай нац. лабараторыі імя Э.А.Лоўрэнса. У 1961—71 старшыня Камісіі па атамнай энергіі

Ж.Сёра. Нядзеля пасля паўдня на востраве Гранд-Жат. 1886.

ЗША. Навук. працы па радыяцыйнай і ядз. хіміі, ядз. фізіцы. Разам з інш. адкрыў шэраг радыеізатопаў; апублікаваў першую таблiцу ізатопаў (1940); сінтэзаваў 10 трансуранавых элементаў (1941—74). Развіў канцэпцыю размяшчэння ў перыядычнай табліцы Мендзялеева трансактыніевых элементаў і прадказання іх уласцівасцей (актыноідная тэорыя; 1944). У яго гонар названы трансуранавы элемент *сібаргій* і малая планета. Нац. навук. медаль ЗША (1991). Нобелеўская прэмія 1951 (разам з Э.М.*Макміланам*).

Тв.: Рус. пер. — Искусственные трансурановые элементы. М., 1965; Ядерные свойства тяжелых элементов. Вып. 1—5. М., 1967—69 (разам з Э.Хайдам, І.Перлман); Человек и атом. М., 1973 (разам з У.Р.Корлісам); Химия актиноидов. Т. 1—3. М., 1991—99 (у сааўт.).

М.М.Касцюковіч.

Г.Сібарг.

Я.Сібеліус.

СІБЕ́ЛІУС (Sibelius) Ян (Юхан; 8.12.1865, г. Хямеэнліна, Фінляндыя — 20.9.1957), фінскі кампазітар, педагог; заснавальнік нац. кампазітарскай школы; адзін з буйн. прадстаўнікоў сусв. сімфанізму. Вучань М.Вегеліуса. З 1891 выкладаў у Хельсінкскай кансерваторыі. Для яго творчасці характэрны віртуознае валоданне тэхнікай кампазіцыі і інструментоўкі, сінтэз класічных і рамантычных традыцый, імкненне да праграмнасці. Арганічна перапрацоўваў муз. фальклор, выкарыстоўваючы яго ладава-гарманічныя і гарманічныя асаблівасці. Творы вылучаюцца своеасаблівай строгасцю і адначасова непасрэднасцю выказвання, для іх характэрны патрыят. матывы, заснаваныя на фін. нар. паэзіі, гісторыі, міфалогіі і эпасе. Сярод твораў: сімфонія «Кулерва» для салістаў, хору і арк. (1892), 7 сімфоній для арк. (1899—1924), праграмныя арк. творы, у т.л. сюіта «Лемінкяйнен» (1893—96), 4 легенды (у т.л. «Туанельскі лебедзь» на сюжэт «Калевалы»), сімф. паэмы, у т.л. «Сага» (апошняя рэд. 1901), «Вясновая песня» (1894), «Фінляндыя» (1899), «Дачка Поўначы» (1906), «Начная скачка і ўсход сонца» (1907), «Тапіёла» (1926), канцэрт для скр. з арк. (1903), «Сумны вальс»; інстр. ансамблі і п'есы; кантаты і хары, каля 100 рамансаў і песень, музыка да драм. спектакляў і інш. З 1951 штогод праводзіцца Міжнар. муз. фестываль «Тыдзень Сібеліуса» (Хельсінкі).

Літ.: Александрова В.Н., Бронфин Е.Ф. Ян Сибелиус. М., 1963.

І.Ю.В'югінава.

СІБІ́Р, большая частка азіяцкай тэр. ў Расійскай Федэрацыі, якая распасціраецца ад Урала на З да хрыбтоў ціхаакіянскага водападзелу на У і ад Паўн. Ледавітага ак. на Пн да стэпаў Казахстана і мяжы з Цэнтр. Азіяй на Пд. Працягласць з З на У больш за 7 тыс. км, з Пн на Пд да 3,5 тыс. км. Пл. з прылеглымі астравамі каля 10 млн. км². У межах С. знаходзіцца 21 суб'ект Расійскай Федэрацыі: рэспублікі — Алтай, Буратія, Саха (Якуція), Тыва, Хакасія; краі — Алтайскі і Краснаярскі; вобласці — Іркуцкая, Кемераўская, Курганская, Новасібірская, Омская, Томская, Цюменская, Чыцінская; аўт. акругі — Агінская Бурацкая, Таймырская, Усць-Ардынская Бурацкая, Ханты-Мансійская, Эвенкійская, Ямала-Ненецкая (гл. адпаведныя арт.). Уключае фізіка-геагр. вобласці *Заходняя Сібір* і *Усходняя Сібір*, у межах якіх размешчаны *Заходне-Сібірская раўніна*, *Сярэднесібірскае пласкагор'е*, горы Паўд. Сібіры (Алтай, Зах. Саян, Усх. Саян, горы Тывы, Прыбайкалле, Забайкалле) і сістэма горных хрыбтоў на ПнУ Сібіры, якія акаймоўваюць Верхаянскі хрыбет і Калымскае нагор'е. У геал. будове С. вылучаюцца *Сібірская платформа* і *Заходне-Сібірская пліта*, якія на Пн і З абмежаваны гарамі палеазойскай складкавасці, на Пд — пратэразойскай, на ПнУ і ПдУ — мезазойскай складкавасці. У антрапагене на Пн С. і ў гарах было зледзяненне. Вял. паклады каменнага і бурага вугалю (Кузнецкі, Канска-Ачынскі, Іркуцкі, Паўд.-Якуцкі, Ленскі і Тунгускі басейны); радовішчы нафты і газу, жал. і поліметалічных руд, рэдкіх і каляровых металаў, графіту, алмазаў, золата і інш. С. размешчана ва ўмераным і субарктычным кліматычных паясах. Клімат б. часткі С. суровы, рэзка кантынентальны, умерана халодны і халодны, на Пн арктычны. Сярэднегадавыя т-ры паветра амаль усюды ніжэй за 0 °С. На Пн сярэдняя т-ра ліп. 0—2 °С, студз. -48 °С, -50 °С, («полюс холаду» Паўн. паўшар'я ў Верхаянску і Аймяконе да -71 °С). На Пд і ПдЗ клімат больш цёплы з т-рай ліп. 22—23 °С, студз. -16 °С, -20 °С. Ападкаў на ПнУ 150—250 мм, на З да 500—550 мм, на Алтаі да 2000 мм за год. Акрамя цэнтр. і паўд. ч. Зах.-Сібірскай раўніны, амаль усюды шматгадовая мерзлата. Сучасныя ледавікі ў гарах на выш. 2000—2500 м. Рэкі С. належаць да бас. Паўн. Ледавітага ак. Найб. рэкі: Об з Іртышом, Енісей з Ангарой, Падкаменнай Тунгускай і Ніжняй Тунгускай, Лена з Алданам і Вілюем, Яна, Індыгірка, Калыма. На ПдУ вытокі р. Амур (бас. Ціхага ак.). Рэкі выкарыстоўваюцца для рачнога транспарту. Шмат ГЭС. Шмат азёр, у іх ліку самае глыбокае ў свеце Байкал, Таймыр, Цялецкае, Чаны. На Пн мохава-лішайнікавая тундра і лесатундра з лістоўніцай. На Пд ад лесатундры зона тайгі з лістоўніцы, кедру, хвоі, бярозы. На Пд Заходняй С. лесастэпавая з бярозавымі і асінавымі гаямі (калкі) і стэпавая зона. Ва Усх. С. лесастэп і стэп займаюць асобныя тэрыторыі. У гарах Паўд. С. вышынная пояснасць з горнымі лясамі і лугамі. Запаведнікі, нац. паркі.

Гісторыя. Як гіст. раён С. уключае таксама Д. Усход. Чалавек насяліў гэтую тэр. ў *каменным веку* і адсюль пранік у Амерыку. У 1-м тыс. н.э. паўд. раёны С. былі ў складзе *Цюркскага каганата*, *Бахай* і інш. дзяржаў. У 13 ст. паўд. С. заваявана манголамі. Частка тэр. С. ўваходзіла ў *Залатую Арду*, потым у Цюменскае ханства і *Сібірскае ханства*. Паходы рас. ваявод (з канца 15 ст.) і Ермака (гл. *Ярмак*) у 1580-я г. паклалі пачатак далучэнню С. да Рас. дзяржавы, якое завершана ў сярэдзіне 19 ст. Вял. ролю ў асваенні і вывучэнні С. і Д. Усходу адыгралі рас. *землепраходцы* 17 ст., камчацкія экспедыцыі В.*Берынга* 1725—30 і 1733—43, падарожжы Г.І.*Невяльскога*, даследаванні І.Дз.*Чэрскага* і інш. У 18 ст. ўзнікла горная прам-сць, у 19 ст. золатаздабыўная, каменнавугальная, харчовая. Адбывалася каланізацыя С. сялянамі з Еўрап. Расіі (пераважна рускімі, украінцамі і беларусамі), якая набыла шырокія маштабы пасля *сялянскай рэформы 1861* і *сталыпінскай аграрнай рэформы* (з 1906). У 1891—1916 пабудавана *Транссібірская магістраль*. Сав. улада, устаноўленая ў канцы 1917 — пач. 1918, неўзабаве скінута белагвардзейцамі і інтэрвентамі; адноўлена ў 1919—22. З канца 17 ст. С. была месцам паліт. катаргі і ссылкі. Сюды былі сасланы ўдзельнікі *Барскай канфедэрацыі* 1768—72, *дзекабрысты*, удзельнікі паўстанняў 1830—31 і 1863—64 у Польшчы, Літве і Беларусі, рэвалюцыянеры-народнікі, сацыял-дэмакраты, эсэры, бальшавікі і інш. У перыяд масавых *рэпрэсій палітычных* 1930—50-х г. у С. і на Д. Усходзе знаходзілася сетка *папраўча-працоўных лагераў* сістэмы ГУЛАГ. Пра беларусаў у С. гл. ў арт. *Расія* (раздзел «Беларусы ў Расіі») і *Новасібірская вобласць* (раздзел «Беларусы ў Новасібірскай вобласці»).

Літ.: Гвоздецкий Н.А., Михайлов Н.И. Физическая география СССР: Азиатская часть. 4 изд. М., 1987; История Сибири с древнейших времен и до наших дней. Т. 1—5. Л., 1968—69; Миллер Г.Ф. История Сибири: Пер. с нем. Т. 1—2. 2 изд. М., 1999—2000; Белорусы в Сибири. Вып. 1—2. Новосибирск, 2000; Галуза У. Беларусы Заходняй Сібіры: гісторыя і сучаснасць // Кантакты і дыялогі. 1998. №10/11.

СІБІРАКО́Ў Аляксандр Міхайлавіч (8.10.1849, г. Іркуцк, Расія — 1893), расійскі золатапрамысловец, даследчык Сібіры. Скончыў палітэхнікум у г. Цюрых. Фінансаваў палярныя экспедыцыі Н.А.Э. *Нордэншэльда* (1878—79), А.В.Грыгор'ева (1879—80), а таксама выданне прац па гісторыі Сібіры. У 1880 спрабаваў прайсці на шхуне праз Карскае м. ў вусце р. Енісей. У 1884 на параходзе прайшоў ад вусця па р. Пячора, на аленях цераз Урал, далей на параходзе па р. Табол да г. Табольск («Сібіракоўскі тракт на поўнач»). Зрабіў значны ўклад у справу эканам. асваення Сібіры. Яго імем названы вострaў у Карскім м. і ледакол.

СІБІ́РСКАЕ МО́РА, адна з назваў *Лапцевых мора*.

СІБІ́РСКАЕ ХА́НСТВА, Сібірскі юрт, феадальная татарская дзяржава ў Зах. Сібіры і Паўн. Казахстане ў 15—16 ст.

Склалася ў 1420—90-я г. ў бас. рэк Табол, Тура, Об, Іртыш пасля распаду *Залатой Арды*. Да пач. 16 ст. сталіца г. Чынгі-Тура (сучасная Цюмень), пазней — г. Кашлык (другая назва Сібір, ад якой і назва ханства). Асн. насельніцтва — цюркамоўныя і уграмоўныя плямёны, якія паступова кансалідаваліся ў тат. этнас (сібірскія татары); ад іх залежалі ханты, мансі і інш. заходнесібірскія народы. Дзярж. рэлігія — іслам. Аснова гаспадаркі — качавая жывёлагадоўля, земляробства, паляванне, рыбалоўства, рамёствы (ганчарства, кушнерства, ткацтва, плаўка і апрацоўка металаў), гандаль з Сярэдняй Азіяй, *Нагайскай Ардой*, *Казанскім ханствам*, Манголіяй, Зах. Кітаем і Рус. дзяржавай. У С.х. правілі ханы — нашчадкі *Джучы* і яго сына Шэйбана, вял. уплывам карысталася качавая арыстакратыя — бекі, мурзы і тайбугі. З узмацненнем у сярэдзіне 16 ст. рус. націску на С.х. ханская ўлада ў ім аслабла, у 1555 хан Едыгер прызнаў сябе васалам Рас. дзяржавы. У 1563 ханам стаў *Кучум*, які з 1572 актыўна выступаў супраць Расіі. У 1581—82 казацкі атаман *Ярмак* пры падтрымцы рус. прамыслоўцаў Строганавых ажыццявіў паход супраць С.х., разбіў асн. войскі Кучума і захапіў Кашлык. У 1585 Кучум знішчыў атрад Ермака, аднак рас. войскі неўзабаве аднавілі прасоўванне ў С.х., будуючы на яго тэр. крэпасці (Тара, Табольск, Бярозаў). У 1598 Кучум канчаткова разбіты рас. ваяводам А.Ваейкавым на р. Бердзь; С.х. спыніла існаванне, яго тэр. далучана да Расіі.

СІБІ́РСКАЯ ПЛАТФО́РМА, дакембрыйская *платформа*, паміж р. Енісей, воз. Байкал і Верхаянскім хр.; адзін з буйнейшых адносна ўстойлівых участкаў кантынентальнай зямной кары ў Паўн. Азіі. Абмежавана на З палеазойскай складкавасцю Заходне-Сібірскай пліты, на Пд і ПдУ — Усходне-Забайкальска-Ахоцкім, на У — Верхаяна-Чукоцкім мезазойскімі складкавымі паясамі. На паверхні С.п. размешчаны Сярэднесібірскае пласкагор'е, Алданскае нагор'е, Паўн.-Сібірская і Цэнтральнаякуцкая нізіны. Магутнасць зямной кары ў межах С.п. 40—48 км, шчыльн. цеплавога патока 20—40 мВт/м^2. Складзена са складкавага крышт. фундамента (метамарфічныя і інтрузіўныя ўтварэнні архею і ніжняга пратэразою) і платформавага чахла. У будове чахла вылучаюць 2 мегакомплексы: ніжні, або даплітны (адклады рыфею), і верхні, або плітны (тоўшчы венду, палеазою, мезазою і кайназою). Магутнасць асадкавых парод да 5 км, у глыбокіх упадзінах да 10—12 км. У раннім пратэразоі, рыфеі, раннім кембрыі, сярэднім палеазоі, верхнім палеазоі, раннім і познім мезазоі С.п. вызначалася інтэнсіўным магматызмам. У яе платформавым чахле пашыраны вулканічныя ўтварэнні і інтрузіі раннетрыясавай трапавай фармацыі, а таксама каледонскія лінейна-складкавыя дыслакацыі. На значнай частцы С.п. адбыліся неатэктанічныя падняцці да 1—2 км. У тэктанічнай будове С.п. вылучаюць гал. структуры: Алданскі шчыт, Лена-Енісейская пліта, ускладненая Анабарскім масівам (з выхадам крышт. парод на паверхню), Тунгускай, Вілюйскай сінеклізамі і ўпадзінамі, закладзенымі ў рыфеі. У межах С.п. буйныя радовішчы жалезных (Алданскі шчыт) і медна-нікелевых руд (Нарыльскі рудны раён), каменнага вугалю (Ленскі, Тунгускі, Канска-Ачынскі і інш. вугальныя басейны), каменнай і калійных солей, гіпсу, фасфарытаў і інш.

В.М.Губін.

СІБІ́РСКАЯ Я́ЗВА, вострая інфекцыйная хвароба жывёл і чалавека, якая характарызуецца пашкоджаннем скуры з утварэннем *карбункулаў*. Узбуджальнік — сібіраязвавая палачка (Bacillus antracis), у чыстай культуры вылучаны Р.*Кохам* (1876). Споры С.я. захоўваюцца ў глебе дзесяткі гадоў. Крыніца інфекцыі — хворыя жывёлы (каровы, коні, авечкі, козы і інш.).

Чалавек заражаецца пры доглядзе за хворай жывёлай, апрацоўцы жывёльнай сыравіны, ужыванні заражаных мясных і малочных прадуктаў. Найчасцей заражэнне адбываецца кантактна-бытавым шляхам, таксама бывае аліментарным, паветрана-кропельным і трансмісіўным (пры ўкусах насякомых-крывасосаў, — ляпнёў, мух-жыгалак). Успышкі С.я. часцей назіраюцца ў летні перыяд. Формы С.я.: скурная, лёгачная, кішэчная і септычная (ускладненне папярэдніх). Пры скурнай форме С.я. ўзбуджальнік пранікае праз мікратраўмы, парэзы, трэшчыны на скуры; узнікае чырв. пляма, пазней утвараецца язва, укрытая цёмнай коркай (адсюль лац. назва С.я. anthrax вугаль). Вакол язвы дробныя пухіркі ў выглядзе караляў, якія разбураюцца і павялічваюць язву. У час фарміравання язвы т-ра цела да 40 °С, галаўны боль, моташнасць, ірвота. Астатнія формы С.я. працякаюць вельмі цяжка, з высокай смяротнасцю. Лячэнне тэрапеўтычнае. Жывёлы пры звышвострым цячэнні С.я. гінуць праз 1—2 дні і нават раптоўна. Фактары перадачы ўзбуджальніка—інфіцыраваная глеба, трупы жывёл, кармы, вада, подсціл. У перахваэолых жывёл ствараецца трывалы імунітэт.

А.А.Астапаў.

СІБІ́РСКІ АНТЫЦЫКЛО́Н, тое, што *Азіяцкі антыцыклон*.

СІБІ́Ў (Sibiu), горад у цэнтр. ч. Румыніі. Адм. ц. аднайменнага жудзеца. Каля 200 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прамысл. цэнтр. Прам-сць: машынабудаванне, у т.л. цяжкае, трансп., станка- і прыладабудаванне; хім., парфумерна-касметычная, дрэваапр., тэкст. (тканіны, трыкатаж, дываны), гарбарна-абутковая, паліграф., харчовая. Музей Брукенталя ў палацы 18 ст. (каштоўны кнігазбор). Шматлікія арх. помнікі (жылыя дамы, цэрквы, палацы, рэшткі ўмацаванняў) 13—18 ст. Турызм.

СІБО́РГІЙ (лац. Seaborgium), Sg, штучны радыеактыўны хім. элемент VI групы перыяд. сістэмы, ат. н. 106. Адкрыты ў 1974; атрыманы ізатопы з масавымі лікамі 259 (Лабараторыя ядз. рэакцый Аб'яднанага ін-та ядз. даследаванняў; г. Дубна, Расія) і 263 (Берклеўская лабараторыя імя Э.А.Лоўрэнса; г.Берклі, штат Каліфорнія, ЗША). Названы ў гонар Г.Т.*Сібарга* (рэкамендацыя Міжнар. саюза тэарэт. і прыкладной хіміі; 1997).

СІВАГРА́К, сіваваронка (Coracias), род птушак сям. сіваваронкавых атр. ракшападобных. 8 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Афрыцы. Жывуць у лесастэпах, лясах, на ўзлесках, каля высечак, у парках і гаях, саваннах, на акультураных землях. На Беларусі 1 від — С. звычайны, або ракша (C. garrulus), нар. назвы краска, сінюга; занесены ў Чырв. кнігу.

Даўж. цела С. звычайнага да 35 см, маса да 190 г. Апярэнне зеленавата-блакітнае з яркім адлівам. На крылах і хвасце ёсць цёмна-сінія

Сіваграк.

ўчасткі. Спіна рыжавата-карычневая. Сярэдняя пара пёраў хваста цёмна-бурая з ліловым напылам. Дзюба моцная, крыху кручкаватая. Корміцца буйнымі жукамі, прамакрылымі, радзей дробнымі пазваночнымі. Нясе 4—6 яец. Зімуе ў Афрыцы.

СІВАЛІ́КСКІЯ ГО́РЫ, Сівалік, Перадгімалаі, паўднёвая, найб. нізкая ступень *Гімалаяў* у Індыі і Непале, паміж хрыбтамі Пір-Панджал і Махабхарат. Утвараюць ланцуг паралельных градаў і хрыбтоў, якія цягнуцца з ПнЗ на ПдУ, выш. да 2591 м (г. Саанчалія), даўж. каля 1700 км. Складзены пераважна з жвіру, пясчанікаў, канглмератаў. Рэзка ўзвышаюцца над Інда-Гангскай раўнінай. Ад Вял. Гімалаяў С.г. аддзелены падоўжнымі далінамі. Высокая сейсмічнасць. Глыбока расчлянёны рэкамі. Для зах. ч. паўд. схілу характэрны селевыя патокі, каля ўсх. падножжаў забалочаныя джунглі (тэраі). На схілах — трапічныя лясы: сухія на З, вільготныя на У. Значная ч. схілаў тэрасавана і занята чайнымі плантацыямі. У выніку празмернага выпасу і высечак адбываецца працэс яраўтварэння.

СІВАПІТЭ́КІ (Sivapithecus), род выкапнёвых чалавекападобных малпаў. Кас-

цяныя рэшткі С. (верхнія і ніжнія сківіцы і зубы) знойдзены ў міяцэнавых слаях гор Сівалік у Індыі і Усх. Афрыцы. Пры даследаванні рэшткаў С. выяўлена падабенства іх з выкапнёвымі вышэйшымі малпамі — дрыяпітэкамі, а таксама з сучасным арангутанам. Частка даследчыкаў лічыць С. продкамі арангутана.

СІВА́С (Sivas), горад у Турцыі, у цэнтр. частцы Анатоліі. Адм. ц. аднайменнага іля. Вядомы да н.э. Стараж. назвы — Кабіра, Дыяспаліс, Себастыя. Каля 250 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд. (вагонабудаванне), металаапр., цэм., дрэваапр., харч., тэкстыльная. Дываначкацтва. Гандл. цэнтр с.-г. раёна (збожжа, буйн. раг. жывёла і авечкі, воўна). Ун-т. Арх. помнікі 11—14 ст. (медрэсэ, мячэці).

СІВАЧЭ́НКА Леанід Аляксандравіч (н. 9.3.1950, г. Магілёў), бел. вучоны ў галіне машынабудавання. Д-р тэхн. н. (1995), праф. (1996). Акад. Бел. інжынернай акадэміі (2000). Скончыў Магілёўскі маш.-буд. ін-т (1977). З 1974 у Магілёўскім тэхн. ун-це (у 1996—99 заг. кафедры). Навук. даследаванні па распрацоўцы тэхнал. абсталявання для комплекснай перапрацоўкі сыравіны і тэхнагенных матэрыялаў.

Тв.: Новая концепция развития помольной техники // Обогащение руд. 1994. №1; Винтовые аппараты и их энерготехнологическая эффективность // Хим. промышленность. 1994. №12.

СІВА́Ш (цюрк.), Гнілое мора, сістэма мелкіх заліваў каля зах. берага Азоўскага м., у Крыме (Украіна). Даўж. 112 км. Пл. каля 2560 км². Аддзелена ад мора пясчанай касой *Арабацкая Стрэлка*. Злучаецца з морам Генічаскім праліварм. Берагі нізкія, пакатыя, гразкія. Вада моцна мінералізаваная.

СІВЕРЦАВА Галіна Міхайлаўна (н. 3.8.1947, г. Ніжні Тагіл Свярдлоўскай вобл., Расія), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Жонка В.Я.*Сіверцава*. Скончыла Уральскае вучылішча прыкладнога мастацтва (1966), Маскоўскае вышэйшае маст.-прамысл. вучылішча (1972). З 1975 працавала на Барысаўскім камбінаце прыкладнога мастацтва (з 1994 дырэктар), з 1998 нам. дырэктара Цэнтра дэкар.-прыкладнога мастацтва ў Мінску. Працуе ў галіне габелена, сцэн. касцюма, сувенірных вырабаў. Творы вызначаюцца вобразнай змястоўнасцю, эмацыянальнасцю, структурным адзінствам каларыту і малюнка. Аўтар манум. габеленаў «Казкі купальскай ночы» (серыя, 1986) для Дома культуры ВА «Хімвалакно» ў Магілёве, «Каля возера» (1998) для рэстарана «Свіцязь» у Мінску; габеленавых заслон для Дома літаратара ў Мінску (1980), для Дома культуры нафтаперапр. з-да ў Мазыры (1992), дзіцячай школы мастацтваў у Магілёве (1993). Сярод інш. твораў: габелены «Чорнае і белае» (1977), «Вехі» (1982), «Па газонах не хадзіць» (1990), «Спляценне лёсу» (1991), «Знак» (1992) і інш.

Г.**Сіверцава**. Фрагмент габелена з серыі «Казкі купальскай ночы». 1986.



В.**Сіверцаў**. Фрагмент фасада Дома культуры ў Слоніме. 1987.

СІ́ВЕРЦАЎ Валерый Якаўлевіч (н. 28.11.1945, г. Цюмень, Расія), бел. мастак. Муж Г.М.*Сіверцавай*. Скончыў Уральскае вучылішча прыкладнога мастацтва (1966), Маскоўскае вышэйшае маст.-прамысл. вучылішча (1971). З 1978 на Мінскім маст. камбінаце. Працуе ў галінах комплекснага маст. праектавання інтэр'ераў, выставак, манум.-дэкар. мастацтва. Аўтар праектаў маст. афармлення інтэр'ераў гал. корпуса Нац. АН Беларусі (1981), рэстарана «Свіцязь» (1984), Палаца моладзі і школьнікаў (1988), рэзідэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (1997—99) у Мінску; манум.-дэкар. скульптуры са зварнага металу для фасада Палаца культуры ў г. Слонім Гродзенскай вобл. (у сааўт., 1987) і інш.

СІВЕ́Ц (Nardus), род кветкавых раслін сям. метлюжковых. 1 від — С. стаячы (N. stricta). Пашыраны ў цеплаўмераным поясе Еўразіі. Заносны ў Паўн. Амерыцы. На Беларусі трапляецца на лясных пясчаных палянах, на ўскрайках балот, часам утварае лугі. Нар. назвы пясюк, чортава барада.

Шматгадовая травяністая расліна выш. 10—40 см. Утварае густыя дзярніны. Сцёблы цвёрдыя, прамастойныя, без вузлоў. Лісце шчацінкападобнае, шызавата-зялёнае, шурпатае. Адмерлае лісце захоўваецца некалькі гадоў і ўтварае светлую «грыву» вакол жывых парасткаў (адсюль назва). Суквецце — аднабокі колас з сядзячымі аднакветнымі каласкамі. Плод — зярняўка. Кармавая расліна нізкай якасці (індыкатар беднасці глебы), выкарыстоўваецца для замацавання пяскоў і як дэкаратыўная. *А.М.Скуратовіч.*

СІВІ́ЛЫ, Сібілы, у старажытных грэкаў, рымлян і некат. інш. народаў легендарныя жанчыны-прарочыцы, якія

Сівец стаячы.

ў экстатычным стане ў вершаванай форме «абвяшчалі» волю багоў, прадказвалі будучыню (звычайна — розныя беды). У рымлян найб. вядомасцю карысталіся т.зв. Куманская і Цібурцінская С. Іх нібыта запісаныя прадказанні («сівіліны кнігі») як вялікую таямніцу захоўвалі жрацы ў храме Юпітэра Капіталійскага і выкарыстоўвалі (да 5 ст. н.э.) у надзвычайных выпадках (паліт. крызісы, войны і інш.). Верагодна, ад імя С. выступалі невядомыя грэч., рым., іудзейскія і інш. аўтары. Да вобразаў С. звярталіся многія ант. і пазнейшыя мастакі і пісьменнікі.

СІ́ВІЦА, вёска ў Івянецкім с/с Валожынскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калект. гаспадаркі добраахвотна аб'яднаных сялян. За 29 км на ПдУ ад горада і 46 км ад чыг. ст. Валожын, 70 км ад Мінска. 442 ж., 159 двароў (2001). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

СІВІ́ЦКАЯ Людвіка Антонаўна, гл. *Верас* Зоська.

СІВІЧА́НКА, рака ў Валожынскім р-не Мінскай вобл., левы прыток р. *Волка* (бас. р. Нёман). Даўж. 21 км. Пл. вадазбору 37 км^2. Пачынаецца на зах. схілах Мінскага ўзв. за 1 км на ПдЗ ад в. Сівіца, цячэ па Налібоцкай пушчы, упадае ў р. Волка за 7,8 км на ПдУ ад в. Белы Бераг Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл. Пойма пераважна забалочаная. Рэчышча да вусця на працягу 4,1 км каналізаванае.

СІВУ́ЧЫ (Eumetopias), род млекакормячых жывёл сям. вушастых цюленяў.

Сівуч.

Адзіны від у родзе — С. (E. jubatus). Пашыраны ў паўн. ч. Ціхага ак.

Даўж. да 3,5 м, маса да 800 кг. Афарбоўка летам рыжая, зімой бурая. Трымаецца статкамі. Размнажаюцца звычайна на камяністых берагах астравоў, самцы ўтвараюць гарэмы з 15—20 самак. Кормяцца рыбай, галаваногімі малюскамі, інш. марскімі жывёламі. Нараджаюць 1 дзіцяня. Промысел дзеля шкуры і тлушчу.

СІВУ́ШНАЕ МА́СЛА, адходы вытв-сці *этылавага спірту* метадам браджэння. Масляністая вадкасць ад светла-жоўтага да чырвона-бурага колеру з непрыемным пахам. Паводле хім. саставу — сумесь ізаамілавага (гл. *Амілавыя спірты*), ізабутылавага і інш. аднаатамных спіртоў: з альдэгідамі, к-тамі і інш. арган. злучэннямі. Выкарыстоўваюць для атрымання асобных спіртоў. С.м. атрутнае, раздражняе слізістыя абалонкі дыхальных шляхоў.

СІВЫ́ ДЗЯ́ЦЕЛ, гл. ў арт. *Дзятлавыя*.

СІГ ЛЕДАВІТАМО́РСКІ, сіг сібірскі, рыба сям. сіговых, гл. *Пыж'ян*.

К.М.Г.Сігбан.

К.М.Сігбан.

СІ́ГБАН, Зігбан (Siegbahn) Кай Мане (н. 20.4.1918, г. Лунд, Швецыя), шведскі фізік. Чл. Швед. АН. Ганаровы чл. Амер. акадэміі мастацтваў і навук. Сын К.М.Г.*Сігбана*. Скончыў Упсальскі ун-т (1942). У 1942—51 у Нобелеўскім ін-це фізікі (Стакгольм); у 1951—54 праф. Каралеўскага тэхнал. ін-та (Стакгольм). З 1954 праф. Упсальскага ун-та. Навук. працы па спектраскапіі, атамнай і малекулярнай фізіцы, фіз. хіміі. Распрацаваў метад электроннай спектраскапіі для хім. аналізу (1951). Сканструяваў рэнтгенаэлектронны спектрометр і ажыццявіў монахраматызацыю рэнтгенаўскага выпрамянення ў рэнтгенаўскай фотаэлектроннай спектраскапіі. Нобелеўская прэмія 1981.

СІ́ГБАН, Зігбан (Siegbahn) Карл Мане Георг (3.12.1886, г. Эрэбру, Швецыя — 25.9.1978), шведскі фізік, заснавальнік рэнтгенаўскай і ядз. спектраскапіі. Чл. Швед. АН (1922). Лонданскага каралеўскага т-ва (1933). Замежны чл. АН СССР (1958). Бацька К.М.*Сігбана*. Скончыў Лундскі ун-т (1911), дзе і працаваў (з 1920 праф.); у 1924—37 праф. Упсальскага ун-та. У 1937—64 дырэктар Нобелеўскага ін-та фізікі (Стакгольм). Навук. працы па спектраскапіі рэнтгенаўскага выпрамянення, ядз. фізіцы і ядз. спектраскапіі. Прапанаваў новыя метады атрымання рэнтгенаўскіх спектраў высокага раздзялення, вывучыў рэнтгенаўскія спектры хім. элементаў і адкрыў новыя спектральныя лініі. Выявіў дысперсію рэнтгенаўскіх прамянёў. Сканструяваў шэраг спец. спектральных прылад. Нобелеўская прэмія 1924.

СІ́ГЕР (Seeger) Піт (н. 3.5.1919, г. Нью-Йорк), амерыканскі спявак, кампазітар, паэт. Выканаўца блюзаў, спірычуэл, балад, антыфаш. песень, песень пратэсту (пад уласны акампанемент на банджа ці гітары). Узначальваў рух за адраджэнне амер. нар. песні. У рэпертуары таксама песні рас. кампазітараў і рус. нар. песні. Здымаўся ў кіно. Складальнік зб. амер. нар. песень, аўтар падручніка «Як іграць на 5-струнным банджа» (2-е выд. 1954).

СІ́ГЕР БРАБА́НЦКІ (Siger de Brabant; каля 1235—82), нідэрландскі філосаф, заснавальнік зах.-еўрап. *авераізму*. З 1266 праф. Парыжскага ун-та. Двойчы асуджаны інквізіцыяй (у 1270 і 1277). У час чарговага следства забіты сваім сакратаром. У трактатах «Аб разумнай душы», «Аб вечнасці свету», «Немагчымае», «Аб неабходнасці і ўзаемасувязі прычын» і ў каментарыях да «Фізікі», «Метафізікі» і інш. твораў Арыстоцеля сфармуляваў тэорыю дваіснасці ісціны, паводле якой ісціны філасофіі і тэалогіі могуць супярэчыць адна адной. Адмаўляў ідэю стварэння Богам свету з нічога і божае наканаванне. Развіваў вучэнне аб усеагульным дэтэрмінізме і абвяргаў існаванне свабоды волі ў чалавека і Бога. Лічыў, што ўсе працэсы і падзеі на Зямлі залежаць ад руху нябесных цел і маюць цыклічны характар. Сцвярджаў, што чалавечы дух (інтэлект) уяўляе сабой вечную, нематэрыяльную субстанцыю, а душа смяротная. Погляды С.Б. абвяргалі *Альберт Вялікі*, *Фама Аквінскі*, Р.Лулій. Вучэнне С.Б. паўплывала на светапогляд *Дантэ*, П.Пампанацы, Дж.*Піка дэла Міранда*лы, аверaістаў *падуанскай школы* і інш.

СІ́ГЕЦІ (Szigeti) Іожэф (Жазеф; 5.9.1892, Будапешт — 20.2.1973), венгерскі скрыпач, педагог. Чл. Нац. акадэміі «Санта-Чэчылія» (Італія). Скончыў Акадэмію музыкі ў Будапешце (1905); вучань Е.*Хубаі*. У 1917—24 выкладаў у Жэнеўскай кансерваторыі. З 1925 у Францыі, ЗША, з канца 1950-х г. у Швейцарыі. Канцэртаваў у 1905—63, у т.л. ў СССР у 1924—37. Стварыў асабісты высокамастацкі стыль, які вызначаўся глыбінёй і натуральнасцю інтэрпрэтацый, спалучэннем стрыманай эмацыянальнасці і дэкламацыйнасці з тонкім пачуццём формы, высокага майстэрства, адухоўленасцю. Першы выканаўца твораў Б.Бартака, Э.Блоха, Э.Ізаі, П.Кадашы, А.Казелы, Г.Кауэла, С.Пракоф'ева, у т.л. прысвечаных яму. Выдаў транскрыпцыі для скрыпкі і фп., у т.л. А.Скрабіна. Аўтар кніг па скрыпічным выканальніцтве («Нататкі скрыпача», 1964).

СІГІ́ (Coregonus), род рыб сям. сіговых атр. ласосепадобных. Самы шматлікі з сямейства. Пашыраны ў бас. Ледавітага, Ціхага і Атл. акіянаў. Прахадныя, азёрныя і рачныя рыбы. Найб. вядомыя: С. звычайны, *рапушкі*, *омуль*, *пелядзь*, *муксун*, чыр і інш. У азёрах Беларусі водзіцца рапушка еўрапейская, або сялява, у 1925 у азёры Браслаўскай, Нарачанскай груп і воз. Лукомскае з Чудска-Пскоўскага воз. завезены для акліматызацыі сіг чудскі (C. lavaretus maraenoides). У азё-

рах Лукомскае і Нарач меў прамысл. значэнне. Пелядзь на Беларусь завезена ў 1957.

Даўж. да 75 см, маса да 8 кг (зрэдку 16 кг). Цела серабрыстае, спіна цёмная, луска буйная. Рот невял., ніжні, канцавы або верхні. Нераст звычайна восенню. Ікра дробная, жоўтая. Кормяцца планктонам, бентасам і дробнай рыбай. Аб'екты промыслу і развядзення.



Сігі: 1 — амурскі; 2 — чудскі; 3 — чыр.

СІГІЗМУ́НД I (лац. Sigismundus, венг. Zsigmond, чэш. Zikmund; 15.2.1368, г. Нюрнберг, Германія — 9.12.1437), імператар «Свяшчэннай Рым. імперыі» [1410—37], венг. кароль [1387—1437], чэш. кароль [1419—21, 1436—37]. Сын імператара Карла IV, апошні з дынастыі *Люксембургаў*. У 1387 у выніку шлюбу з дачкой венг. караля Лаяша Вялікага стаў венг. каралём. Узначаліў крыжовы паход аб'яднанага еўрап. войска супраць туркаў, разбіты тур. султанам *Баязідам I*. Адзін з ініцыятараў і ўдзельнікаў царк. Канстанцкага сабора (1414—18), санкцыяніраваў пакаранне смерцю Я.*Гуса*, якому раней даў ахоўную грамату. Пасля смерці брата Вацлава IV (1419) атрымаў у спадчыну чэш. прастол, арганізаваў супраць гусітаў крыжовыя паходы (гл. *Гусіцкія войны*). У 1421 пазбаўлены чэш. прастола Часлаўскім сеймам, зноў абвешчаны каралём у 1436 сеймам у Іглаве. Сваім пераемнікам прызначыў аўстр. герцага Альбрэхта. Агульнае абурэнне ў Чэхіі палітыкай С. I прымусіла яго збегчы. Памёр па дарозе з Чэхіі ў Венгрыю.

СІГІЛЯ́РЫІ (Sigillariaceae, Sigillariales), сямейства (або парадак) выкапнёвых дрэва- і дзеразападобных раслін. Трапляюцца ў адкладах кам.-вуг. і пермскага перыядаў Еўропы і Паўн. Амерыкі. Былі пашыраны ў тропіках, месцамі дамінавалі ў ландшафтах.

Выш. 10—12 (да 30) м. Ствол прамы, калонападобны, неразгалінаваны або дыхатамічна разгалінаваны ўверсе. Ствол і галіны ўкрытыя правільна размешчанымі чаргаванымі лускападобнымі рубцамі ад апалага лісця. Драўніна слабаразвітая, кара магутная. Спараносныя шышкі буйныя, развіваліся на канцы ствала. Знізу ствол пераходзіў у галінастыя карані (стыгмарыі). Лісце вузкае. Стваліы С. адыгралі важную ролю ў працэсах утварэння каменнага вугалю. Па выкапнёвых рэштках С. вызначаюць узрост геал. адкладаў.

СІГНА́Л (ад лац. signum знак) у б і я л о г і і, працэс або з'ява (вонкавая, унутраная, усвядомленая або неўсвядомленая), што перадае паведамленне пра падзею і арыентуе жывую сістэму адносна гэтай падзеі. У залежнасці ад характару сенсорнай сістэмы адрозніваюць С. акустычныя, аптычныя, біярытмічныя, тактыльныя, тэрмічныя, хім., электрамагнітныя і інш. (гл. *Раздражняльнасць, Рэактыўнасць, Сігнальныя сістэмы*).

С. у т э х н і ц ы, умоўны знак, фіз. працэс ці з'ява, што нясе паведамленне (інфармацыю) аб якой-н. падзеі, стане аб'екта назірання, а таксама перадае каманду кіравання абвяшчэння ці інш. Агульныя заканамернасці перадачы і пераўтварэнняў С. вывучае *інфармацыі тэорыя*.

Бывае мех. (дэфармацыя, перамяшчэнне), цеплавы (напр., павышэнне т-ры), светлавы (успышка святла, зрокавы вобраз), эл. (імпульс току, радыёхваля), гукавы (мова, музыка, свіст) і інш. Інфармацыя, якую мае паведамленне прадстаўляецца зменамі аднаго ці больш параметраў С. — амплітуды (інтэнсіўнасці), працягласці, частаты, шырыні спектра, палярызацыі і інш. С. можна пераўтвараць (без змены зместу паведамлення) з аднаго віду ў другі, напр., неперарыўны С. — у дыскрэтны, гукавы — у эл., эл. — у светлавы. Выкарыстанне канкрэтных С. залежыць ад асаблівасцей канкрэтных задач перадачы паведамленняў, узроўню і характару перашкод, магчымасцей рэалізацыі прыёмнай і перадавальнай сістэм. Гл. таксама *Сігнал геадэзічны, Сігналізацыя, Сігналы часу*.

СІГНА́Л БЕ́ДСТВА «SOS» н а м о р ы, падаецца караблямі (суднамі), гідрасамалётамі, што церпяць бедства, з мэтай прыцягнуць да сябе ўвагу і атрымаць дапамогу. Бесперапынны паўтор сігналаў па азбуцы Морзе (3 кароткія, 3 доўгія, 3 кароткія) пераасэнсаваны ў англ. выраз «Save Our Souls» — ратуйце нашы душы. Устаноўлены згодна з Міжнар. канвенцыяй 1908. Для экстраннай перадачы і прыёму С.б. судны маюць аўтам. радыётэхн. прыстасаванні, якія працуюць на аварыйнай хвалі. Выкарыстоўваць С.б. «SOS» у інш. мэтах забараняецца.

СІГНА́Л ГЕАДЭЗІ́ЧНЫ, наземная частка *геадэзічнага знака* — вышка. Робіцца ў выглядзе двайной піраміды на пунктах *трыянгуляцыі*, радзей — *паліганаметрыі*. Прызначаны для ўстаноўкі геадэз. інструментаў на пунктах дзярж. геадэз. сеткі высокай дакладнасці на вышыні, якая забяспечвае прамую бачнасць на сумежныя знакі. У залежнасці ад класа трыянгуляцыі знакі размяшчаюцца на адлегласці ад 5—10 км да 30—50 км. С.г. падзяляюцца на простыя (выш. 6—15 м) і складаныя (выш. 16—55 м).

СІГНАЛАГРА́МА, любы *носьбіт інфармацыі* з сігналамі запісанай інфармацыі. У залежнасці ад характару запісанай інфармацыі і віду носьбіту С. мае назвы *відэафанаграма, фанаграма* і інш. Акрамя асн. інфармацыі можа мець службовыя сігналы.

Паводле спосабу і фармату запісу, канструкцыі прылад запісу-ўзнаўлення, канкрэтных носьбітаў запісу С. бывае мех., магн., аптычная і інш.; падоўжная, радковая, папярочна-радковая, нахілена-радковая, многаканальная і інш. Фармат С. вызначае яе памеры, а таксама памеры, размяшчэнне, прызначэнне і змест зон, дарожак, радкоў і слаёў запісу, фарматы кодаў і віды сігналаў. Напр., фармат DAT — лічбавая магн. фанаграма ў касеце, CD і DVD — адпаведна аптычная фанаграма і відэафанаграма на дыску.

А.П.Ткачэнка.

СІГНАЛІЗА́ЦЫЯ (ад *сігнал*), падаванне ўмоўных знакаў (сігналаў), якімі прыцягваюць да чаго-н. увагу, апавяшчаюць, перадаюць загады, паведамленні, забяспечваюць двухбаковыя перагаворы; умоўныя знакі і сістэмы прыстасаванняў, што выкарыстоўваюцца з гэтай мэтай. Адрозніваюць С. зрокавую (прадметная або аптычная), гукавую і тактыльную (успрымаецца органамі дотыку). У залежнасці ад прызначэння бывае аварыйная, выклікальная (або пошукавая), кантрольна-распарадчая (або аператыўная), папераджальная, перагаворная.

Прасцейшы від С. — марская і на транспарце, дзе сігнальнымі сродкамі служаць *маякі, святлафоры, семафоры, знакі дарожныя, пуцявыя знакі*, гукавыя сігналы і інш. Больш дасканалая аптычная С., ажыццяўляецца з дапамогай ліній *аптычнай сувязі*. У вытв. умовах кантроль і кіраванне складанымі сістэмамі робіцца з дапамогай аўтам. С.: інфармацыя аб аварыйным стане сістэмы перадаецца *мнеманічнымі схемамі*, акустычнымі сродкамі (*сірэнамі, свісткамі*, званкамі, гудкамі), мігальным святлом. У ВМФ выкарыстоўваюць магутныя *пражэктары* і ліхтары, а таксама ракеты з *сігнальнымі саставамі*. У паветр. флоце сродкам С. служаць вонкавыя аэранавігацыйныя сігнальныя агні самалётаў і аэрамаякі. Эл. перадача сігналаў дае магчымасць адначасова перадаваць вял. колькасць розных сігналаў на значныя адлегласці і ў розныя пункты (гл. *Тэлекіраванне*); выкарыстоўваюцца для кіравання энергасістэмамі, на лініях электрапередачы, на чыг. транспарце (гл. *Чыгуначная сігналізацыя*). Пашыраны таксама радыётэхн. сродкі С.: у метэаралогіі, аэралогіі, у марскім і паветр. флоце (напр., *радыёзонды, радыёлакацыйныя станцыі, радыёмаякі*). Гл. таксама *Пажарная сігналізацыя*.

СІГНА́ЛЫ, адзін з найб. стараж. родаў гукавай творчасці прыкладнога прызначэння. Вядомы ўсім народам свету.

Адрозніваюць моўныя С. (перагукванні, клічы), вак. (напр., бел. і ўкр. «хойканні») і інструментальныя. Узнікненне С. абумоўлена неабходнасцю зносін на значнай адлегласці. Існуюць С. паляўнічыя, пастухоўскія, вартавыя, ваен., паштовыя, чыг., магічныя, культавыя, цырыманіяльныя, спарт. і інш. Выкарыс-

тоўваюцца сігн. інструменты розных тыпаў: мембранныя (барабан, літаўры), самагучальныя (біла, гонг, звон, трашчотка) і духавыя (труба, рог). Тэхніка-канструкцыйныя выразныя магчымасці такіх інструментаў, спецыфіка нац. муз. традыцый, канкрэтнае грамадскае прызначэнне сігнальных найгрышаў вызначаюць разнастайнасць семантыкі і відаў С. Яны прадстаўлены неўпарадкаванымі дамуз. шумамі, асобнымі рытмічнымі фігурамі без фіксаванай вышыннасці гукаў і найгрышамі. Для апошніх характэрна сувязь з моўнымі інтанацыямі клічу, звароту, фанфарнасць мелодыкі, пункцірнасць рытмікі, варыянтнасць маштабна-структурных адзінак, імправізацыйнасць стылістыкі і выканання.

На працягу многіх стагоддзяў С. адыгрывалі ў жыцці ўсх. славян, у т.л. беларусаў, важную грамадскую ролю. Паводле стараж.-бел. гіст. помнікаў, з дапамогай С. склікалі народ на веча (напр., звон у Полацку), паведамлялі пра небяспеку (пажар, паводка, набліжэнне ворага), падтрымлівалі сувязь у час ваен. дзеянняў («трубы трубят городеньские...» у «Слове аб паходзе Ігаравым», 12 ст.), віталі князя і яго дружыну, іншаземных гасцей, суправаджалі нар. і культавыя абрады, святкаванні, арыентавалі падарожнікаў у непагадзь, адзначалі час. Выкарыстоўвалі ў час палявання (рагавыя С. ў «Песні пра зубра» Міколы Гусоўскага), у побыце пастухоў (труба, рог, драўляныя або метал. званкі), паляўнічых (труба, рог, трашчотка), у розных быт. абставінах (біла-калатушка) і інш. Асаблівае месца адводзілася С. у ваен. побыце С. — адзін з асн. «першасных жанравых пачаткаў», які паўплываў на развіццё многіх жанраў прафес. муз. мастацтва (І.С.Бах, Л.Бетховен, Р.Вагнер, Г.Берліёз, П.Чайкоўскі, М.Рымскі-Корсакаў), у т.л. бел. (Я.Цікоцкі, Я.Глебаў і інш.).

Літ.: Назина Н.Д. Белорусские народные музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые. Мн., 1979.

І.Дз.Назіна.

СІГНА́ЛЫ ЧА́СУ, сігналы, якія служаць для адліку часу. Перадаюцца па радыё і тэлебачанні ў пэўныя моманты сутак. Вызначаюцца з дапамогай атамных (гл. *Квантавы гадзіннік*) і астр. (гл. *Гадзіннік астранамічны*) прылад.

Для спец. мэт (*служба часу*, навігацыя, геадэзія) С.ч. перадаюцца ў выглядзе груп імпульсаў, што дазваляе параўноўваць час з высокай дакладнасцю. Для праверкі звычайных гадзіннікаў у краінах СНД С.ч. перадаецца вяшчальнымі радыёстанцыямі пасылкамі з 6 імпульсаў; пачатак апошняга імпульсу супадае з пачаткам наступнай гадзіны паяснога часу. З 1972 перадаюцца ў міжнар. каардынаванай шкале атамнага часу, узгодненне якой са шкалой *сусветнага часу* ажыццяўляецца зрушэннем мінутнага сігналу на 1 с адначасова ўсімі радыёстанцыямі (звычайна ў канцы года).

СІГНА́ЛЬНАЯ МУ́ЗЫКА, музыка прыкладнога прызначэння, пераважна для ваен.-дух. аркестра. Вытокі ў сігнальнагукавой дзейнасці стараж. чалавека. Гл. *Сігналы*.

СІГНА́ЛЬНЫ ПІСТАЛЕ́Т, ракетніца, гладкаствольны *пісталет*, што страляе сігнальнымі і асвятляльнымі патронамі. Прызначаны для апавяшчэння, перадачы каманд, данясенняў, сігналаў бедства, кароткачасовага асвятлення мясцовасці. Патроны С.п. забяспечваюцца «светлавымі зорачкамі» розных колераў (гл. *Сігнальныя саставы*). Для падачы светлавых і гукавых сігналаў могуць выкарыстоўвацца таксама газавыя пісталеты і рэвальверы. Гл. *Самаховы зброя*.

В.І.Вараб'ёў.

СІГНА́ЛЬНЫЯ САСТА́ВЫ, разнавіднасць *піратэхнічных саставаў* у патронах, факелах, ракетах і інш. для падачы ноччу і днём бачных на адлегласці сігналаў.

Бываюць агнявыя (гл. *Асвятляльныя саставы*) і дымавыя; складаюцца з акісляльніку, гаручага і дамешкаў, якія афарбоўваюць полымя ці ўтвараюць каляровы дым (солі натрыю — жоўты, барыю — зялёны, стронцыю — чырвоны і інш.). Гаручае, што забяспечвае большую яркасць полымя — магній. С.с. выкарыстоўваюцца ў піратэхн. боепрыпасах, у сігнальных вырабах мірнага прызначэння (на водным і чыг. транспарце), а таксама пры вырабе сродкаў для феерверкаў. Гл. таксама *Піратэхніка*.

СІГНА́ЛЬНЫЯ СІСТЭ́МЫ, сістэмы ўмоўнарэфлекторных сувязей, якія фарміруюцца ў кары вял. паўшар'яў галаўнога мозга пры паступленні ў яе імпульсаў ад вонкавых і ўнутр. раздражняльнікаў. Забяспечваюць дакладнае ўзаемадзеянне ч. арганізма і тонкае прыстасаванне арганізма да навакольнага асяроддзя. Тэрмін «С.с.» ўведзены І.П.*Паўлавым* (1932), які вылучыў агульную для жывёл і чалавека першую сігнальную сістэму і спецыфічную толькі для чалавека *другую сігнальную сістэму*. Першая сігнальная сістэма — сістэма канкрэтных, адчувальна непасрэдных вобразаў рэчаіснасці, якія фіксуюцца мозгам чалавека і жывёл у форме адчуванняў і ўспрыманняў. З'яўляецца сукупнасцю шматлікіх (нават вельмі складаных) умоўных і безумоўных рэфлексаў на непасрэдныя раздражняльнікі або іх сляды, на яе аснове функцыянуе *вышэйшая нервовая дзейнасць*. У чалавека характарызуецца большай, чым у жывёл, скорасцю нерв. працэсаў, рухомасцю, утварэннем умоўных рэфлексаў вышэйшых парадкаў. Першая і другая С.с. функцыянуюць у цесным узаемадзеянні і адзінстве, пры гэтым у чалавека другая С.с. адыгрывае вядучую ролю.

С.С.Ермакова.

СІГНАТУ́РА (позналац. signatura ад лац. signare абазначаць, указваць), 1) частка рэцэпта з указаннем спосабу прыёму лякарства; таксама копія рэцэпта ўрача, якая прыкладаецца да выдадзенага аптэкай лякарства. 2) Парадкавы нумар кожнага друкаванага аркуша ў кнізе, часопісе, які друкуецца на 1-й і 3-й яго старонках злева ўнізе з мэтай кантролю за правільнасцю фальцоўкі і брашуравання.

СІГНЕ́ВІЧЫ, вёска ў Бярозаўскім р-не Брэсцкай вобл., на левым беразе канала Вінец, каля аўтадарогі Мінск—Брэст. Цэнтр сельсавета. За 15 км на ПдЗ ад г. Бяроза, 100 км ад Брэста, 20 км ад чыг. ст. Бяроза-Картузская. 417 ж., 204 двары (2001). Лясніцтва, швейны цэх унітарнага гандл. прадпрыемства «Бярозаўскае». Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — касцёл св. Дзевы Марыі (1795).

СІГУРА́НЦА (Siguranță), назва тайнай паліт. паліцыі ў Румыніі ў 1921—44. Засн. з мэтай разгрому рэв. арг-цый і барацьбы з дэмакр. рухам. Падпарадкоўвалася ген. дырэктару мін-ва ўнутр. спраў. Паводле некат. звестак С. арыштавала (з 1924) больш за 75 тыс. чал. Ліквідавана пасля *народнага ўзброенага паўстання ў Румыніі 1944.*

СІГУРДСАН (Sigurðsson) Іоўн (17.6.1811, Пафсейры, Ісландыя — 7.12.1879), дзеяч ісландскага нац.-вызв. руху, гісторык. У 1833—35 вучыўся ў Капенгагенскім ун-це. З 1844 дэп. альцінга, з 1845 яго старшыня. У 1835—55 выступаў за адмену дацкай гандл. манаполіі ў Ісландыі, наданне Ісландыі абласной аўтаноміі, устанаўленне рэальнай уніі з Даніяй на ўзор швед.-нарв. уніі 1814— 1905. У 1848—49 прапанаваў тэзіс пра юрыд. права Ісландыі на поўную дзярж. незалежнасць з аддзяленнем ад Даніі. Аўтар ісландскай канстытуцыі ад 5.1.1874, «бацька незалежнасці Ісландыі». Выдаваў (з 1853) крыніцы па стараж. гісторыі Ісландыі.

СІД КАМПЕАДО́Р [Cid Campeador, сапр. Дыяс дэ Бівар (Díaz de Bivar) Радрыга; каля 1043, Бівар, каля г. Бургас, Іспанія — 10.7.1099], палкаводзец у час *Рэканкісты*, іісп. нацыянальны герой. Служыў каралю Санча II, разам з якім выхоўваўся пры двары. Пасля забойства Санча II (1072) на службе ў караля Альфонса VI Ліёнскага і Кастыльскага. Трапіў у нямілась, з 1081 у ссылцы; служыў правадыру маўраў Сарагосы. Пасля прымірэння ў 1086 з Альфонсам VI падпарадкаваў яму ўсе тэр. на У Іспаніі. У 1094 атрымаў перамогу над Альмаравідамі ў бітве за Валенсію, якой кіраваў да сваёй смерці як самастойны манарх. Вобраз С.К. адлюстраваны ў іісп. нар. эпасе «*Песня пра майго Сіда*», у творах П.Карнеля, І.Гердэра і інш.

У.Я.Калаткоў.

СІ́ДА, грудніка (Sida), род кветкавых раслін сям. мальвавых. Каля 150 (паводле інш. звестак да 300) відаў. Пашыраны ў тропіках і субтропіках. У Амерыцы і Еўропе культывуюць С. вострую (S. acuta) і шматгадовую (S. napala), у Індыі і Афрыцы — С. рамбалістую (S. rombifolia). На Беларусі інтрадукавана С. гермафрадытная (S. hermaphrodita).

Шматгадовыя травяністыя, кустовыя і паўкустовыя расліны. Сцёблы прамастойныя, выш. 2—4 м. Лісце чаргаванае, 5—7-лопасцевае, клінападобнае або суцэльнае. Дробныя кветкі белыя ці жоўтыя, адзіночныя або сабраныя па 5—10 у суквецце. Плод — каробач-

ка. Сцёблы маюць 13—19% валакна, якое разам з ільняным, джутавым і кенафавым выкарыстоўваюць для вытв-сці грубых тканін і вяровак. Тэхн., кармавыя, меданосныя расліны.
А.М.Скуратовіч.

СІДАНС (Siddons) Сара (5.7.1755, г. Брэкан, Вялікабрытанія — 8.6.1831), англійская актрыса; прадстаўніца позняга класіцызму. Сцэн. дзейнасць пачала ў правінцыяльных т-рах. У 1755 у т-ры «Друры-Лейн» (ролі Порцыі і лэдзі Ганны ў п'есах «Венецыянскі купец» і «Рычард III» У.Шэкспіра). У 1776—82 зноў у правінцыяльных т-рах. Роля Ізабелы («Ракавы шлюб» Т.Саутэрна) у т-ры «Друры-Лейн» (1782) прынесла ёй вядомасць як трагічнай актрысы. Выдатная выканаўца жан. вобразаў у п'есах Шэкспіра: лэдзі Макбет («Макбет»), Канстанца («Кароль Джон»), Афелія («Гамлет»), Імагена («Цымбелін»).

Літ.: История западноевропейского театра. Т. 3. М., 1963.

СІДАР, другая назва вадасховішча *Гранд-Рапідс* у Канадзе.

СІДАРАВА Глафіра Пятроўна (н. 2.12.1922), расійская актрыса. Нар. арт. Комі (1949). Засл. арт. Расіі (1967). Нар. арт. СССР (1980). Скончыла Комі-студыю Дзярж. ін-та тэатр. мастацтва (1942). З 1942 у Комі рэсп. драм. т-ры імя В.А.Савіна (г. Сыктыўкар). Актрыса шырокага дыяпазону з яркім тэмпераментам і вял. унутранай сілай. Сярод роляў: Настасся Піліпаўна («Ідыёт» паводле Ф.Дастаеўскага), Кабаніха («Навальніца» А.Астроўскага), Квашня («На дне» М.Горкага), Лушка («Узнятая цаліна» паводле М.Шолахава), Любка Шаўцова («Маладая гвардыя» паводле А.Фадзеева) і інш.

СІДАРАВІЧЫ, вёска ў Магілёўскім р-не, каля аўтадарогі Магілёў—Гомель. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 24 км на Пд ад Магілёва. 554 ж., 215 двароў (2001). 2 дрэваапр. цэхі. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Царква. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнікі сав. воінам і землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СІДАРАЎ Юрый Уладзіміравіч (н. 8.5.1927, с. Рап'ёўка Базарна-Карабулакскага р-на Саратаўскай вобл., Расія), бел. акцёр. Нар. арт. Беларусі (1977). Скончыў Маск. тэатр. вучылішча імя М.С.Шчэпкіна (1949). Працаваў у Гродзенскім абл. драм. т-ры, з 1954 у Нац. акад. драм. т-ры імя М.Горкага. Адначасова з 1968 выкладае ў Бел. АМ. Творчасці С. ўласцівы лаканічныя выразныя сродкі, знешняя стрыманасць пры ўнутр. напружанасці, дакладнасць дэталей, пластычнасць маст. вобраза. Выканаўца гераічных, лірычных, вострахарактарных, камед. роляў. Ролі ў бел. рэпертуары т-ра імя М.Горкага: лейтэнант Наганаў, палкоўнік Кусонскі, паліцай Зыль («Брэсцкая крэпасць», «Галоўная стаўка», «Дзеля жыцця» К.Губарэвіча), Гарачун («Білет у мяккі вагон» А.Маўзона), Дробыш, Хазяінаў («Трывога», «Соль» А.Петрашкевіча), Чарвякоў («Знак бяды» паводле В.Быкава) і інш. Ролі ў класічным рэпертуары: Мікіта («Улада цемры» Л.Талстога), Пратасаў, Бардзін, Ягор Булычоў, Бубнаў, Жан («Дзеці сонца», «Ворагі», «Ягор Булычоў і іншыя», «На дне» М.Горкага, «Букееў і кампанія» паводле п'есы «Якаў Багамолаў» М.Горкага), Актавій Цэзар, Банка («Антоній і Клеапатра», «Макбет» У.Шэкспіра), барон Бэрлі («Марыя Сцюарт» Ф.Шылера) і інш. Псіхалагічна паглыблена раскрыў характары Аарне («Каменнае гняздо» Х.Вуаліёкі), Бернарда Шоу («Мілы лгун» Дж.Кілці), Дасбергена Мустафаева («Узыходжанне на Фудзіяму» Ч.Айтматава і К.Мухамеджанава), Гартмана («Дзікунка» Ж.Ануя), Фушэ («Вячэра» Ж.Брысвіля) і інш. Удзельнічае ў тэлевізійных і радыёспектаклях.
Б.І.Бур'ян.

Ю.У.**Сідараў**.

Г.С.**Сідаровіч**.

Я.А.**Сідаровіч**.

А.В.**Сідарэнка**.

Ю.**Сідараў** у ролі Ягора Булычова.

СІДАРАЎКА, вёска ў Краснапольскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 1 км на З ад г.п. Краснаполле, 110 км ад Магілёва, 52 км ад чыг. ст. Камунары. 741 ж.,. 286 двароў (2001). Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Магіла ахвяр фашызму і партызан. На паўн.-ўсх. ускраіне вёскі курганны могільнік эпохі Кіеўскай Русі.

СІДАРО́ВІЧ Вадзім Яўгенавіч (н. 23.6.1962, Мінск), бел. вучоны ў галіне заалогіі і экалогіі. Д-р біял. н. (1997). Скончыў БДУ (1985). З 1985 у Ін-це заалогіі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па тэрыялогіі, эвалюц. экалогіі і папуляцыйнай біялогіі жывёл, заканамернасцях эвалюц. станаўлення і функцыянавання ў сучасных экасістэмах згуртавання пазваночных драпежнікаў і іх ахвяр у ландшафтах Паазерскага зледзянення.

Тв.: Норки, выдра, ласка и другие куньи. Мн., 1995; Куньи в Беларуси: Эволюцион. биология, демография и биоценотич. связи. Мн., 1997.

СІДАРО́ВІЧ Георгій Сцяпанавіч (21.11.1903, Мінск — 6.5.1985), генерал-палкоўнік танк. войск (1962). Скончыў ваен. акадэміі механізацыі і матарызацыі (1937), Генштаба (1941). У Чырв. Арміі з 1922: камандзір батарэі, нач. штаба дывізіёна. У Вял. Айч. вайну з 1941 нач. штаба асобнай танк. дывізіі, у штабе Гал. бранятанк. ўпраўлення Чырв. Арміі; з 1944 на 1-м Прыбалт., 1-м і 2-м Бел. франтах: нач. штаба механіз. корпуса, танк. арміі. Удзельнік баёў пад Смаленскам, Сталінградам, Кіевам, на Курскай дузе, вызвалення Беларусі, Прыбалтыкі, Усх.-Прускай аперацыі. З 1945 на адказных пасадах у войсках, цэнтр. апараце Мін-ва абароны СССР.

СІДАРО́ВІЧ Яўген Антонавіч (н. 10.3.1928, г. Бярэзіно Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне фізіялогіі, экалогіі, інтрадукцыі раслін і ахове навакольнага асяроддзя. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1989), д-р біял. н. (1985), праф. (1986). Засл. дз. нав. Беларусі (1978). Скончыў Мінскі тэхнал. ін-т (1952). З 1965 у Цэнтр. бат. садзе Нац. АН Беларусі (з 1971 нам. дырэктара, з 1976 дырэктар, з 1997 заг. лабараторыі). Навук. працы па тэарэт. асновах эколага-фізіял. маніторынгу раслін і аптымізацыі тэхнагеннага асяроддзя буйных прамысл. цэнтраў Беларусі сродкамі азелянення. Выявіў адаптацыйныя магчымасці і фітаіндыкацыйную значнасць расл. комплексаў у прамыслова развітых раёнах Беларусі. Распрацаваў матэм. мадэль прадукц. працэсу хвойных экасістэм. Дзярж. прэмія Беларусі 1978.

Тв.: Функционирование лесных фитоценозов в условиях антропогенных нагрузок. Мн., 1985 (разам з Ж.А.Рупасавай, Я.Р.Бусько); Экологический мониторинг лесных ландшафтов Белоруссии. Мн., 1988 (у сааўт.); Техногенное загрязнение лесных экосистем Беларуси.

Мн., 1995 (у сааўт.); Радиационно-тепловой режим лесов Беларуси в условиях техногенной среды. Мн., 1997 (разам з Ж.А.Рупасавай, Я.Р.Бусько).

СІДАРУ́К Ігар Хведаравіч (н. 23.7.1964, г. Кобрын Брэсцкай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1986). З 1988 карэспандэнт перыяд. выданняў. З 1993 заг. літ.-драм. часткі Брэсцкага абл. т-ра лялек. Друкуецца з 1986. Выдаў кн. паэзіі «Чарнабель» (1991), «Саната Арганата» (1993), «Моўкнасць» (1997), кн. прозы «Квадратная варона» (2000), кн. для дзяцей «Павучальныя гісторыі дзядзечкі Сіда Рука» (1994). Аўтар п'ес «Люстрынка, або Ваша несусветнае зладзейства!» (паст. 1992), «Галава» (паст. 1992, апубл. 1997), «Меч анёла» (паст. 1993), «Пра дзедку Міхедку, пра бабку Агапку ды пра Катка — Залатога лабка», «Янка зух і нячысты дух» (абедзве паст. 1994), «Збавіцель», «Штукары» (абедзве паст. 1995), «Плач, саксафон!» (паст. 1995, Нац. т-р імя Я.Коласа 1996), «Дрэва багоў» (паст. 1996), «Кірмашовы балаган» (паст. 1998), «Залатая табакерка» (паст. 2001, Гран-пры на Міжнар. тэатр. фестывалі «Белая вежа», Брэст) і інш. Апубл. п'есы «Кветкі пад ліўнем», «Прагнасць — не ў радасць» (абедзве 1992), «Торба» (1993), «Крывая імша», «Крык» (абедзве 1995) і інш.

І.У.Саламевіч.

СІДАРЦО́Ў Уладзімір Нічыпаравіч (н. 9.11.1935, в. Клімаўка Гомельскага р-на), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1988), праф. (1991). Засл. работнік адукацыі (2001). Скончыў БДУ (1958) і з 1966 працуе ў БДУ (з 1992 заг. кафедры). Асн. кірункі даследаванняў — гісторыя Беларусі, рабочага класа, гістарыяграфія і метадалогія гісторыі, гіст. інфарматыка. Адзін з аўтараў і складальнікаў абагульняльных прац, вучэбных дапаможнікаў для школ і ВНУ, у т.л. «Гісторыя рабочага класа Беларускай ССР» (т. 2, 1985), «Гісторыя Беларусі, XX ст.» (2-е выд., 1993), «Сусветная гісторыя навейшага часу» (кн. 1—2, 1993), «Гісторыя Беларусі, 1917—1996» (1997), «Гістарычная інфарматыка: (Інфарматыка для гістарычных спецыяльнасцей)» (1998) і інш.

Тв.: Классы и партии в период Великой Октябрьской социалистической революции. Мн., 1971; Государственная деятельность рабочего класса БССР (1921—1937 гг.). Мн., 1978; Методология исторического исследования (механизм творчества историка). Мн., 2000.

СІДАРЭ́НКА Аляксандр Васілевіч (19.10.1917, с. Новамікалаеўка Мялоўскага р-на Луганскай вобл., Украіна — 23.3.1982), расійскі геолаг. Акад. АН СССР (1966, чл.-кар. 1953). Скончыў Варонежскі ун-т (1940). З 1943 у Туркменскім і з 1950 у Кольскім філіялах АН СССР. З 1961 нам. старшыні Дзяржкамітэта Расіі па каардынацыі н.-д. работ. З 1962 міністр геалогіі СССР. З 1975 віцэ-прэзідэнт АН СССР. Навук. працы па працэсах мінералаўтварэння ва ўмовах пустыні і тундры, літалогіі стараж. метамарфічных парод, заканамернасцях працэсаў стараж. і сучаснага гіпергенезу, асадкавай геалогіі дакембрыю. Ленінская прэмія 1966.

Тв.: Основные черты минералообразования в пустыне // Вопросы минералогии осадочных образований. Львов, 1956. Кн. 3—4; К вопросу о литологическом изучении метаморфических толщ. М.; Л., 1961 (разам з В.І.Лунёвай); Органическое вещество в осадочно-метаморфических породах докембрия. М., 1975 (разам з С.А.Сідарэнка).

Г.І.Сідарэнка.

СІДАРЭ́НКА Валерый Аляксеевіч (н. 20.4.1939, Мінск), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі машынабудавання. Канд. тэхн. н. (1971). Скончыў БПІ (1961). З 1963 у Фізіка-тэхн. ін-це АН Беларусі. З 1979 у Рэсп. міжгаліновым ін-це павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў. З 1991 у БПА. Навук. працы па тэорыі і практыцы апрацоўкі металаў рэзаннем, распрацоўцы тэхналогіі памерна-чыставой апрацоўкі дэталей машын і прылад. Дзярж. прэмія Беларусі 1974.

Тв.: Применение малоотходных, безотходных и ресурсосберегающих технологических процессов в металлообработке в промышленности Белоруссии. Мн., 1988 (разам з А.Р.Арловым); Технологические возможности ротационного резания материалов. Мн., 1990 (разам з А.В.Совусем).

СІДАРЭ́НКА Георгій Іванавіч (н. 21.8.1925, Кіеў), бел. вучоны ў галіне кардыялогіі. Акад. Нац. АН Беларусі (1996), чл.-кар. (1974), д-р мед. н., праф. (1969). Засл. дз. нав. Беларусі (1985). Засл. вынаходнік Беларусі (1990). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1950). З 1952 у Мінскім мед. ін-це, з 1961 заг. кафедры, адначасова ў 1971—77 кіраўнік лабараторыі. З 1977 дырэктар, з 1993 кансультант НДІ кардыялогіі. Навук. працы па клінічнай і эксперым. кардыялогіі, мед. тэхніцы, клінічнай і эксперым. фармакалогіі. Распрацаваў метады індывідуалізацыі лячэбных працэдур, аўтаматызацыі экстраннага аналізу кардыялагічнай інфармацыі, аналізу сардэчна-сасудзістай інфармацыі з дапамогай універсальных выліч. машын. Стварыў апараты аўтаматызаванай біякіравальнай дыягностыкі і тэрапіі сардэчна-сасудзістых хвароб. Удзельнічаў у стварэнні новага пакалення лек. прэпаратаў сардэчна-сасудзістага дзеяння. Дзярж. прэмія Беларусі 1996.

Тв.: Кибернетика и терапия. М., 1970; Ранняя инструментальная диагностика гипертонической болезни и атеросклероза. Мн., 1973 (у сааўт.); Психофизиологические аспекты кардиологических исследований. Мн., 1982 (разам з Г.С.Барысавай, К.К.Агеенкавай); Инструментальные методы исследования в кардиологии. Мн., 1994 (у сааўт.).

СІДАРЭ́НКА Мікалай Мікалаевіч (28.9.1905, г. Курск, Расія — 24.12.1980), рускі паэт, перакладчык. Скончыў Маскоўскі мех. ін-т імя Ламаносава (1931). Друкаваўся з сярэдзіны 1920-х г. У лірыцы пераважае грамадз.-патрыят. тэматыка. Творы 1950—70-х г. вызначаюцца філасафічнасцю, спавядальнасцю, асэнсаваннем гісторыі свайго народа, асабістага лёсу. Аўтар зб-каў «Незабыўнае» (1959), «Завеі і лебедзі» (1970), «Трыліснік» (1980) і інш. На рус. мову пераклаў вершы і паэму «Курган» Я.Купалы, вершы А.Куляшова, С.Грахоўскага, К.Кірэенкі, А.Пысіна. *М.І.Мішчанчук.*

СІДАРЭ́НКА-САЛДАЦЁНКА Савелій Герасімавіч (15.12.1905, в. Чырвоны Бераг Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 26.10.1980), адзін з кіраўнікоў патрыят. падполля і партыз. руху на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Скончыў Маскоўскі пед. ін-т імя Леніна (1938), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1938). У Чырв. Арміі з 1927, з 1938 нач. штаба дывізіі, пам. нач. аператыўнага аддзела штаба БВА, нач. разведвальнага, аператыўнага аддзелаў штаба арміі. Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну з 1941 у партызанах, са жн. 1943 камандзір Магілёўскага партыз. злучэння, чл. Магілёўскага падп. абкома КП(б)Б. З 1944 нам. наркома асветы БССР, у 1946—62 на гасп. рабоце.

СІДЗЁЛЬНІКАВА Галіна Феліксаўна (н. 25.10.1927, Мінск), бел. дыктар радыё. Засл. арт. Беларусі (1975). Вучылася ў Бел. тэатр.-маст. ін-це (1948—50). Працавала ў газ. «Мінская праўда» (з 1950). У 1958—93 дыктар Бел. радыё (у 1980—83 кіраўнік дыктарскай групы). Вяла перадачы разнастайнага жанру: літ.-драм. радыёкампазіцыі, радыёпастаноўкі. Удзельнічала ў трансляцыях урачыстых маніфестацый, вечароў і інш. Вяла перадачу для дзяцей «Загадкі лясной палянкі». *С.Ф.Гаціла.*

СІДЗЁНКА Аляксандр Трафімавіч (н. 25.9.1926, Кіеў), бел. вучоны ў галіне гігіены працы. Д-р мед. н. (1983), праф. (1996). Скончыў Пермскі мед. ін-т (1949). З 1961 у БелНДІ санітарыі і гігіены (заг. лабараторыі у 1969—96, заг. аддзела). Навук. працы па вывучэнні рэпрадукцыйнай функцыі працуючых жанчын, асновах гігіены працы і прафпаталогіі ў вытв-сці шкловалокнаў і інш.

СІДЗУО́КА, горад у Японіі, на Пд цэнтр. часткі в-ва Хонсю. Адм. ц. аднайм. прэфектуры. Каля 500 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Аванпорт С. — г. Сімідзу. Цэнтр раёна вырошчвання мандарынаў і чаю. Прам-сць: электра- і тэкст. машынабудаванне, аўтамабіле-, авія- і суднабудаванне, каляровая і чорная металургія,

вытв-сць мэблі, лакавых вырабаў, тэкст., папяровая, харчасмакавая (чайная). Ун-т.

СІДЗЯ́К Віктар Аляксандравіч (н. 24.11.1943, г. Анжэра-Суджанск Кемераўскай вобл., Расія), бел. спартсмен (фехтаванне на шаблях). Засл. майстар спорту СССР (1968). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1973). З 1973 інструктар

В.А.Сідзяк.

спарт. клуба Беларускай ваен. акругі. Чэмпіён XIX (1968, Мехіка), XXI (1976, г. Манрэаль, Канада), XXII (1980, Масква) і сярэбраны прызёр XX (1972, г. Мюнхен, Германія) Алімп. гульняў у камандным заліку. Чэмпіён XX і бронз. прызёр XXI Алімп. гульняў у асабістым заліку. Чэмпіён свету (1969, Гавана; 1970, Анкара; 1971, Вена; 1974, г. Грэнобль, Францыя; 1975, Будапешт; 1979, г. Мельбурн, Аўстралія) і сярэбраны прызёр (1973, г. Гётэбарг, Швецыя) у камандным заліку. Чэмпіён свету (1969), сярэбраны (1973) і бронз. (1971, 1974) прызёр у асабістым заліку. Чэмпіён СССР у камандным (1968, 1970, 1972, 1974, 1976, 1978, 1980) і асабістым (1973, 1978) заліках.

СІ́ДНЕЙ (Sydney), горад на ПдУ Аўстраліі. Адм. ц. штата Новы Паўднёвы Уэльс. 3664 тыс. ж. (2000). Пачатковы пункт чыгунак і аўтадарог углыб краіны, порт на беразе зал. Порт-Джэксан Ціхага ак. Міжнар. аэрапорт. Найбуйнейшы эканам. цэнтр краіны. Прам-сць: машынабудаванне, у т.л. трансп., эл.-тэхн., радыёэлектроннае; чорная і каляровая металургія, нафтаперапр., хім., тэкст., паліграф., харч., папяровая. Метрапалітэн. Ун-т (з 1850). Оперны тэатр. Музеі: аўстралійскі, ваенна-мемарыяльны, геал., прыкладнога мастацтва, маст. галерэя. Заапарк. Штогадовыя аукцыёны шэрсці. Месца правядзення XXVII летніх Алімпійскіх гульняў (2000).

Засн. ў 1788 як англ. калонія для ссылкі злачынцаў з метраполіі. Першае еўрап. паселішча ў Аўстраліі. Назва ад імя брыт. міністра ўнутр. спраў лорда Сідні. У 1842 атрымаў гар. права. Адкрыццё ў 1851 каля С. залатых прыскаў паспрыяла хуткаму развіццю горада і росту яго насельніцтва. З 2-й пал. 19 ст. С. — гал. прамысл. цэнтр штата Новы Паўднёвы Уэльс і ўсёй Аўстраліі.

У цэнтры С. — эклектычныя будынкі 19 ст. Жылыя раёны абкружаюць кольцам (радыус 20—30 км) дзелавыя ч. горада. У С. шмат садоў, паркаў, бат. сад, заапарк, нац. парк. Сярод сучасных збудаванняў работы арх. Г.Зайдлера (пераважна 1960-я г.), оперны т-р (1959—66, арх. І.Утзан), арачны мост цераз заліў Порт-Джэксан (даўж. 2 км) і інш.

СІДО́Р Сяргей Іванавіч (25.5.1937, в. Янаўшчына Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл. — 17.7.1998), бел. географ. Д-р пед. н. (1991), праф. (1992). Скончыў БДУ (1964). З 1971 у Магілёўскім пед. ін-це. З 1974 у БДУ, адначасова з 1995 нам. рэдактара час. «Геаграфія: праблемы выкладання». Навук. працы па эканам. геаграфіі Беларусі. Аўтар падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для школ і ВНУ.

Тв.: Социально-экономическая география СССР: наука и учебная дисциплина. Мн., 1989; Хрестоматия по экономической географии БССР. Мн., 1991 (у сааўт.); Займальная геаграфія Беларусі. Мн., 1995 (разам з С.М.Адзінцовым). *І.М.Шаруха.*

СІДР (ад франц. cidre), слабае насычанае вуглякіслым газам віно, якое атрымліваюць зброджваннем яблычнага соку. Мае 5—7% (аб'ёмных) этылавага спірту; паводле колькасці цукру падзяляюць на салодкі (мае цукру 10 г/л), паўсухі (5 г/л) і сухі (менш за 0,3 г/л). Пачалі вырабляць у Паўн. Францыі, дзе С. наз. любы алкагольны напітак, атрыманы з яблыкаў.

СІ́ДРА, Сірт Вялікі, заліў Міжземнага м. каля берагоў Лівіі. Даўж. 115 км, шыр. каля ўвахода 465 км, глыб. да 1374 м. Прылівы паўсутачныя (да 0,4 м). Парты — Бенгазі, Марса-эль-Бурэйка, Эс-Сідэр.

СІ́ДЫ-БЕЛЬ-АБЕ́С, горад на ПнЗ Алжыра. Адм. ц. аднайм. вілайі. Засн. ў 1843. Каля 200 тыс. ж. (2001). На аўтадарозе і чыгункі, якія злучаюць Алжыр з Марока. Аэрапорт. Гандл.-прамысл. цэнтр. Прам-сць: харч. (мукамольная, сыраробчая, алейная), абутковая, с.-г. машынабудаванне. Прадпрыемствы па зборцы радыёпрыёмнікаў і тэлевізараў.

СІДЭРАФІ́ЛЬНЫЯ ЭЛЕМЕ́НТЫ (ад грэч. sidēros жалеза + phileō люблю), група хім. элементаў з іонамі пераходнага тыпу. Да іх належаць элементы (пераважна VIII групы перыядычнай сістэмы), жалеза, кобальт, нікель, рутэній, родый, паладый, осмій, ірыдый, тытан, малібдэн, рэній. Вылучаны В.М.*Гольдшмітам* у 1924 як група элементаў, што складаюць ядры планет. Пры звычайных умовах С.э. ферамагнітныя або парамагнітныя. У прыродзе трапляюцца ў самародным выглядзе (*плаціна самародная*, осмісты ірыдый), утвараюць злучэнні з серай і мыш'яком (напр., сульфіды і арсеніды жалеза, кобальту, нікелю), з кіслародам (напр., *магнетыт, гематыт, ліманіт*) і інш. элементамі. У зямной кары найб. пашыраны жалеза (4,65%), менш — кобальт ($1,8 \cdot 10^{-3}$%) і нікель ($5,8 \cdot 10^{-3}$%). Багатыя С.э. і жалезныя метэарыты (да 80—90% жалеза, 6—18% нікелю, 0,5—1% кобальту і інш.), у меншай колькасці каменныя. *У.Я.Бардон.*

СІДЭРА́ЦЫЯ (ад франц. sidération), заворванне зялёнай масы раслін-сідэратаў (зялёнага ўгнаення) для абагачэння гле-

Панарама **Сіднея**.

Сідней. Дзелавы цэнтр.

бы арган. рэчывам і азотам. Для С. вырошчваюць пераважна бабовыя культуры — лубін, сырадэлю, рутвіцу, баркун, чыну, канюшыну і інш.

Расліны на фазе цвіцення заворваюць ці скошваюць для ўгнаення інш. палёў. С. спрыяе павышэнню ўрадлівасці глеб (асабліва пясчаных, супясчаных і эрадзіраваных) і ўраджайнасці (напр., збожжавых культур на 8—10 ц/га, бульбы на 40—50 ц/га). Сідэраты вырошчваюць як *прамежкавыя культуры*, ці сеюць у міжрадкоўі.

СІДЭРЫ́Т (грэч. sidēritis, ад sidēros жалеза), жалезны шпат, мінерал класа карбанатаў, карбанат жалеза, $FeCO_3$. Мае ў сабе аксід жалеза FeO да 62,1%, прымесі магнію, марганцу, кальцыю. Крышталізуецца ў трыганальнай сінганіі. Утварае зярністыя агрэгаты, канкрэцыі, зямлістыя масы, нацёчныя формы, зрэдку крышталі ромбаэдрычныя, таблітчастыя, прызматычныя і інш. Колер жаўтавата-белы, у акіслена-га С. — карычневы да чорнага з чырв. адценнем. Цв. 4. Шчыльн. 3,96 г/см^3. Паходжанне асадкавае, гідратэрмальнае метамарфічнае. Гал. мінерал жалезных руд. Радовішчы ў Расіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Аўстрыі, на Украіне і інш.

СІДЭРЫ́ЧНЫ ГОД [ад лац. sidus (sideris) нябеснае свяціла, зорка], зорны год, прамежак часу паміж 2 паслядоўнымі вяртаннямі Сонца, пры яго бачным гадавым руху, у адно і тое ж (адносна зорак) месца нябеснай сферы. Роўны перыяду поўнага абарачэння Зямлі вакол Сонца (адносна зорак). Складае 365,25636 сярэдніх сонечных сутак.

СІДЭРЫ́ЧНЫ МЕ́СЯЦ, зорны месяц, прамежак часу паміж 2 паслядоўнымі вяртаннямі Месяца, пры яго бачным месячным руху, у адно і тое ж (адносна зорак) месца нябеснай сферы. Працягласць непастаянная, можа мяняцца на некалькі гадзін. Сярэдняе значэнне С.м. 27,321661 сярэдніх сонечных сутак. С.м. роўны перыяду поўнага абарачэння Месяца вакол Зямлі (адносна зорак).

СІЕ́ЛА (Siella), род кветкавых раслін сям. парасонавых. 2 віды. Пашыраны ў нетрапічных раёнах. На Беларусі 1 від — С. прамая (S. erecta), занесеная ў Чырв. кнігу. Трапляецца па берагах канаў і ручаёў, на ўскрайках балот.

Шматгадовыя травяністыя прыбярэжнаводныя расліны. Сцёблы прамастойныя або прыўзнятыя, у ніжняй ч. моцна разгалінаваныя, выш. 40—150 см. Лісце чаргаванае, няпарна-перыстае, ніжняе знаходзіцца ў вадзе, або плавае на паверхні. Кветкі дробныя, белыя ў складаных парасоніках на кароткіх кветаносах. Плод — віслаплоднік. Меданосныя расліны. *А.М.Скуратовіч.*

СІЕ́НА (Siena), горад у Цэнтр. Італіі. Адм. ц. аднайм. правінцыі. Каля 70 тыс. ж. (2001). Трансп. вузел. Прам-сць: харч., дрэваапр., хім., эл.-тэхн., радыёэлектронная. Апрацоўка мармуру. Ун-т. Акадэмія прыгожых мастацтваў і музычная. Музеі: археал., Нац. пінакатэка (сіенскі жывапіс 12—16 ст.), «Опера Метрапалітана» (музей сабора). Цэнтр турызму.



Сідэрыт.

Сіела прамая.

Засн. рымлянамі як ваен. калонія ў 1 ст. да н.э. З 8 ст. н.э. — рэзідэнцыя біскупа. З 12 ст. камуна, апора гібелінаў (гл. *Гвельфы і гібелiны*) у Сярэдняй Італіі, якая варагавала з Фларэнцыяй. У 13—14 ст. С. — найбуйн. еўрап. банкаўска-ліхварскі і рамесніцкі (сукнароб-ства) цэнтр. У 1240 засн. ун-т. У 14 ст. зараджаюцца мануфактуры. У 1399—1404 С. пад уладай міланскіх герцагаў *Вісконці*, у 1487—1525 у С. тыранія Петручы. У 1531—52, 1555—57 — icп. уладанне. З 1557 у складзе Фларэнційскага герцагства, з 1860 — Сардзінскага (з 1861 — Італьянскага) каралеўства.

Старая ч. горада захавала сярэдневяковае, пераважна гатычнае аблічча. Сярод арх. помнікаў: сабор (1284—1376, арх. Дж.Пізана і інш.; амбон скульпт. Н.Пізана), касцёлы Сан-Даменіка (1293—1391), Сан-Францэска (1326—1476), палацы Таламеі (з 1205), Публіка (1297—1310, дабудовы 17 ст.; фрэскі А.Ларэнцэці, С.Марціні і інш.), Лоджыя дэль Папа (1460, арх. А.Федэрыгі, Францэска ды Джорджа) і інш.

СІЕНІ́Т (ад грэч. Syēnē Сіена — назва стараж. егіп. г. Сун, цяпер Асуан), інтрузіўная магматычная горная парода, складзеная са шчолачных *палявых шпатаў* (60—90%) і цемнаколерных мінералаў (10—40%; *піраксен, рагавая падманка, біятыт*). Структура поўнакрышт. раўнамерна-зярністая. Колер ад ружовага да шэрага. Шчыльн. 2,6—2,75 г/см^3. Паводле ўтрымання крэменязёму адносіцца да сярэдніх магматычных парод. Падзяляюцца на 3 групы: нармальнай, павышанай шчолачнасці і шчолачныя. Адрозніваюць С.: піраксенавыя, біятытавыя, рогавападманкавыя, нефелінавыя; да С. адносяцца таксама *лампрафіры*. Утвараюцца з сіенітавай магмы, уваходзяць у склад граніто-ідных і габроідных інтрузіваў, радзей утвараюць самаст. целы. Выкарыстоўваецца як сыравіна на шчолач, скульптурны, дэкар.-абліцовачны і буд. камень, у керамічнай вытв-сці і інш. *В.І.Ярцаў.*

СІЕ́НСКАЯ ШКО́ЛА, мастацкая школа Італіі ў 13—16 ст. з цэнтрам у г. Сіена. Зыходзіла з традыцый італа-візант. і гатычнага жывапісу. У перыяд росквіту школы (13—1-я пал. 14 ст.) творы яе

Сіена. Сабор.

Да арт. **Сіенская школа.** С.Марціні. Пасвячэнне святога Марціна ў рыцары.

майстроў (*Дуча ды Буаніэсенья*, С.*Марціні* і інш.) вызначаліся адухоўленым лірызмам, эмац. насычанасцю мяккага каларыту, вытанчанасцю лінейнага рытму. С.ш. цесна звязана з пошукамі Джота ды Бандоне і творчасцю фларэнційскіх майстроў протарэнесансу, жывапісам братоў Ларэнцэці. У 15 ст. яе адметнымі рысамі былі вытанчаны дэкаратывізм, лірычная сузіральнасць, атмасфера казачнасці (Джавані ды Паала). У 16 ст. паступова страціла сваё значэнне. *Я.Ф.Шунейка.*

СІЁС, Сіеес, Сьеес (Sieyès) Эмануэль Жазеф (3.5.1748, г. Фрэжус, Францыя — 20.6.1836), дзеяч *Французскай рэвалюцыі 1789—99*. Да рэвалюцыі абат. Аўтар брашуры «Што такое трэцяе саслоўе?» (1789). Ад трэцяга саслоўя Парыжа выбраны дэпутатам у Ген. штаты 1789. Па прапанове С. сход прадстаўнікоў трэцяга саслоўя абвясціў сябе Нац. сходам. С. удзельнічаў у выпрацоўцы *Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна*. Адзін з заснавальнікаў Якабінскага клуба. У наступныя гады ўхіляўся ад вызначэння сваёй пазіцыі. Будучы чл. *Канвента*, галасаваў за смяротнае пакаранне Людовіка XIV. Пасля контррэв. тэрмідарыянскага перавароту (1794) разгарнуў актыўную паліт. дзейнасць. Адзін са складальнікаў канстытуцыі 1795, якая ўстанавіла рэжым *Дырэкторыі*. Актыўна рыхтаваў дзярж. пераварот 18 брумера 1799; стаў адным з трох часовых консулаў, з 1800 чл. Сената. З 1803 чл. Франц. акадэміі. У 1816—30 у выгнанні як «царазабойца».

СІЁН, 1) узгорак у *Іерусаліме*, дзе, паводле біблейскіх паданняў, знаходзіліся рэзідэнцыя цара *Давіда* і храм бога *Яхве*. У іудаізме сімвалізуе царства божае на зямлі і на небе. 2) У праваслаўным культе — сярэбраная пасудзіна ў выглядзе хрысц. царквы для захоўвання *просвір*. 3) Назва шэрагу груз. сярэдневяковых цэркваў. 4) Чэш. сярэдневяковая крэпасць у г. Кутна-Гора, апошняя апорная база *табарытаў*. З падзеннем С. ў 1437 звязана канчатковае паражэнне гусіцкага руху.

СІЗІ́Ф, Сісіф, у старажытнагрэчаскай міфалогіі сын Эола — родапачынальніка племя эалійцаў, будаўнік і цар Стараж. *Карынфа*. Праславіўся сваёй хітрасцю. С. падмануў нават багіню смерці Танатас і закаваў яе ў кайданы (вызвалена *Арэсам* праз некалькі гадоў, на працягу якіх людзі не паміралі), потым быў адзіным з памерлых, каму ўдалося ўцячы з царства мёртвых — *аіда*. Калі С. зноў, ужо назаўсёды, трапіў у аід, то быў жорстка пакараны багамі за свае хітрыкі і злачынствы: яго прымусілі бясконца коціць на высокую гару вялізны камень, які, дасягнуўшы вяршыні, кожны раз скочваўся ўніз. Адсюль выразы «сізіфава праца», «сізіфаў камень» — цяжкая, марная, бясконцая праца.

СІЗКО́ Вера Аляксандраўна (2.3.1916, г. Верхнядзвінск Віцебскай вобл. — 25.3.1999), бел. музыказнавец, педагог. Скончыла Ленінградскую кансерваторыю (1948). У 1948—74 выкладчык Мінскага муз. вучылішча імя М.І.Глінкі (з перапынкам), адначасова ў 1948—68 — Бел. кансерваторыі (з перапынкам), у 1959—64 на Рэсп. радыё (маст. кіраўнік, гал. рэдактар муз. вяшчання, старшыня муз.-рэпертуарнай камісіі). У 1974—89 выкладчык Бел. тэатр.-маст. ін-та. Даследавала бел. опернае мастацтва, творчасць бел. кампазітараў. Складальнік зб-каў арт. пра Р.Шырму «Песня на ўсё жыццё», песень «Спадчына» на вершы Я.Купалы і Я.Коласа (абодва 1983), аўтар муз. радыё- і тэлеперадач.

Тв.: Белорусская советская опера. Мн., 1959; И.М.Лученок // Они пишут для детей. М., 1980. Вып. 3; Творчае гарэнне // Мастацтва Беларусі. 1989. №11; Свет духоўнай музыкі // Там жа. 1999. №10. *І.М.Шмелькіна.*

СІЗО́Ў Уладзімір Ільіч (1840, Масква — 1.11.1904), расійскі археолаг. Скончыў Маскоўскі ун-т (1865). Адзін з заснавальнікаў маскоўскага гіст. музея, з 1881 яго вучоны сакратар. Даследаваў славяна-рускія старажытнасці. У 1890 праводзіў раскопкі курганоў каля вёсак Іпалітаўка (Новабяляеўка) на Гомельшчыне, Чырвоная Слабада і Туравічы на Магілёўшчыне. Вынікі даследаванняў радзіміцкіх курганоў абагульніў у працы «Аб паходжанні і характары курганных скроневых кольцаў і пераважна так званага маскоўскага тыпу» (1895). У канцы 1890-х г. у вярхоўях Дняпра адкрыў *доўгія курганы*. У 1902 першы з археолагаў на аснове матэрыялаў з раскопак Гнёздаўскіх курганоў на Смаленшчыне выступіў супраць «нарманскай» тэорыі.

Тв.: [Отчет о раскопках в Смоленской и Могилевской губерниях в 1890 г.] // Древности: Тр. Москов. археологического о-ва. М., 1894. Т. 15, вып. 2; Курганы Смоленской губернии. Вып. 1. СПб., 1902.

СІЙГ (Siig) Арві (н. 8.11.1938, Талін), эстонскі паэт, перакладчык. Засл. пісьменнік Эстоніі (1986). Вучыўся ў Талінскім пед. ін-це і Тартускім ун-це (1957—63). Друкуецца з 1958. Аўтар зб-каў вершаў «Сола на трубе» (1962), «Рэпарцёр з кінакамерай верша» (1966), «Блакітнае атэльe» (1969), «Сузор'е шішыні» (1973), «Пераломная пара» (1976), «Радыус чутнасці» (1978), «Эпіграмафон» (1980), «Святыя будні» (1983) і інш. Яго лірыка публіцыстычная, шматгранная, скіраваная да самааналізу, у ёй тэмы сучаснасці і вечнасці. Перакладае вершы Г.Бураўкіна, А.Вярцінскага, У.Паўлава. На бел. мову вершы С. перакладалі Р.Барадулін, Ю.Голуб, А.Грачанікаў, В.Дашкевіч, К.Камейша, Паўлаў, Ю.Свірка, Я.Сіпакоў, В.Шымук.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Гняздоўе вятроў. Мн., 1986; У кн.: Скарбы старога Тоомаса. Мн., 1988; У кн.: Братэрства, 88. Мн., 1988; У кн.: На волю птушку выпускаю. Мн., 1989; Рус. пер. — Сиреневые сигналы. М., 1973; Перекресток. М., 1976; Ливень об асфальт. Таллинн, 1976. *У.А.Паўлаў.*

СІКАТЫ́ВЫ (ад позналац. siccativus які высушвае), рэчывы, што паскараюць высыханне лакафарбавых матэрыялаў, якія маюць алеі (*пакосты, алейныя лакі, алейныя фарбы*, алкідныя і інш. смолы). Паводле механізму дзеяння з'яўляюцца *каталізатарамі* акісляльнай полімерызацыі астаткаў ненасычаных тлустых кіслот алею. Уплываюць таксама на якасць лакафарбавых пакрыццяў: паляпшаюць іх мех. і ахоўныя ўласцівасці, павялічваюць гідрафобнасць і каразійную ўстойлівасць.

Найб. пашыраныя С. — солі монакарбонавых кіслот (мылы) пераходных (кобальт, марганец, цынк і інш.) і непераходных (свінец, кальцый) металаў, растваральныя ў алеях і арган. растваральніках, нерастваральныя ў вадзе. Выкарыстоўваюць мылы пераважна 2-этылгексанавай, 2-этылгептанавай, нафтэнавых і сінт. тлустых кіслот, а таксама насычаных кіслот алеяў, талавага масла (солі талаты), каніфолі (рызінаты). У прам-сці С. вырабляюць у выглядзе растворaў у уайт-спірыце, ізапрапаноле і інш. лятучых арган. растваральніках, часам у выглядзе пастаў і парашкоў. У лакафарбавыя матэрыялы звычайна дадаюць сумесі С., якія маюць іоны розных металаў; пашыраны сістэмы кобальт — свінец, кобальт — цынк, свінец — марганец — кобальт і інш.; падбор камбінацый металаў вызначаецца іх сінергетычным дзеяннем.

СІКЕ́ЙРА (Siqueira) Жазе (24.6.1907, Кансейсан, штат Параіба, Бразілія — 1985), бразільскі кампазітар, дырыжор, педагог. Вучыўся ў кансерваторыі ў Рыо-дэ-Жанейра, у Сарбоне (Парыж). Праф. Нац. муз. школы. Адзін з заснавальнікаў (1940) і маст. кіраўнік (да 1948) Бразільскага сімф. аркестра. Для яго творaў характэрны яркі нац. каларыт, шырокае выкарыстанне муз. фальклору: балет «Карнавал у Рэсіфі» (1947), опера «Спагадлівая» (1960), араторыя «Кандомбле» (1958), 3 сімфоніі (усе 1951), «4 індзейскія паэмы» (1944), кантаты, інстр. канцэрты і інш. Аўтар муз. дапаможнікаў і падручнікаў.

СІКЕ́ЙРАС, Альфара Сікейрас (Alfaro Siqueiros) Хасэ Давід (29.12.1898, г. Чыўаўа, Мексіка — 6.1.1974), мексіканскі жывапісец і графік; адзін з заснавальнікаў мексіканскай школы манум. жывапісу. Ганаровы чл. АМ СССР (1967). Вучыўся ў АМ (1911), школе Санта-Аніта (1913) у Мехіка. Удзельнік мекс. рэвалюцыі 1910—17. З 1919 працаваў у Францыі і Іспаніі; у 1921 выдаў у Барселоне «Маніфест рэвалюцыйнага мастацтва». Заснавальнік (1922) і ген. сакратар (1923—25) «Рэвалюцыйнага сіндыката працаўнікоў тэхнікі і мастацтва». З 1924 адзін з кіраўнікоў Мексіканскай камуніст. партыі, з 1929 ген. сакратар Мексіканскай унітарнай прафсаюзнай канфедэрацыі. Неаднаразова быў арыштаваны. У 1932—34 і 1935—36 працаваў у ЗША. Дзейнасць С. ў Аргенціне (1933), Чылі (1941—42), на Кубе (1943) паўплывала на развіццё манум. мастацтва ў краінах Лац. Амерыкі. Яго работы вылучаюцца смелым стылем, насычанасцю фарбаў, дынамікай форм. Стварaў манум. кампазіцыі, у якіх канкрэтныя персанажы

спалучаюцца з сімвалічнымі ўвасабленнямі сац.-гіст. сіл, выкарыстоўваў новыя метады перспектывы, спалучаў жывапіс са скульптурнымі формамі, ужываў новыя маст. матэрыялы (сінтэтычныя фарбы, керамічную мазаіку і інш.): размалёўкі Нац. падрыхтоўчай школы (1922—23), клуба прафсаюзаў электрыкаў (1939), Палаца прыгожых мастацтваў (1945, 1950—51), Нац. музея гісторыі (пачаў у 1959; усе ў Мехіка). У 1950—60-я г. ў трактоўцы гіст. падзей і вобразаў узмацніліся выразнасць і паліт. вастрыня. Аўтар мазаікі і рэльефаў на фасадзе рэктарата Універсітэцкага гарадка ў Мехіка (1952—54), манум.-дэкар. збудавання «Паліфорум» (1971), якое спалучае архітэктуру, жывапіс і скульптуру станковых карцін, літаграфій, малюнкаў. Іл. гл. таксама ў арт. *Мексіка*.

Літ.: Григулевич И.Р. Сикейрос. М., 1980; Семенов О.С. Д.А.Сикейрос. М., 1980. *С.У.Пешын.*

Д.Сікейрас. Размалёўка Нац. музея гісторыі ў Мехіка. 1964.

СІКЕРТ (Sickert) Уолтэр Рычард (31.5.1860, г. Мюнхен, Германія — 22.1.1942), англійскі жывапісец і графік; адзін з вядучых майстроў англ. *імпрэсіянізму*. З 1868 жыў у Вялікабрытаніі. Вучыўся ў маст. каледжы Слейда (з 1881). Зазнаў уплыў Дж.Уістлера, Э.Дэга. Заснавальнік «Новага англійскага мастацкага клуба» (1885—86). З 1928 прэзідэнт Каралеўскага т-ва брыт. мастакоў. Яго дакладным па назіраннях пейзажам Лондана і Венецыі, партрэтам, інтэр'ерам жылых памяшканняў і мюзік-холаў уласцівы гучнасць колеру і празрыстасць, меланхалічнасць настрою. Сярод твораў: «Царква Сен-Жак» (каля 1890), «Сан-Марка. Венецыя» (1895—96), «П'яцэта» (каля 1901), «Жанчына ў гандоле» (1905), «Нуда» (1913—14), «Тэатр Новага Бедфарда» (1915—16).

СІКІМ, штат Індыі, ва ўсх. Гімалаях. Мяжуе з Непалам, Кітаем, Бутанам. Пл. 7,3 тыс. км². Нас. каля 500 тыс. чал. (2001) — народы тыбецкага паходжання, выхадцы з Непала і Бенгаліі. Адм. ц. — г. Гангтак. С. — горная краіна. Горы выш. 6—8 тыс. м на Пн (г. Канчэнджанга, выш. 8585 м), каля 2 тыс. м на Пд. Клімат мусонны, у далінах умераны, у гарах халодны. У далінах сярэднія т-ры паветра ў студз. каля -4 °С, у ліп. каля 16—18 °С. Ападкаў каля 3000 мм за год. Лістападныя і хвойныя лясы займаюць каля 50% тэрыторыі. Развіта пераважна сельская гаспадарка. У далінах рэк вырошчваюць рыс, кукурузу, батат, сою. С. — гал. пастаўшчык *кардамону* на сусв. рынак. Гадуюць буйн. раг. жывёлу і авечак. Лесанарыхтоўкі. Здабыча і перапрацоўка поліметал. руды. Невял. прадпрыемствы харч. і тэкст. прам-сці. Саматужныя промыслы (рэчы хатняга ўжытку, разьба па дрэве, вырабы з серабра, дываны). Транспарт аўтамабільны і ўючны. Турызм.

Стараж. насельніцтва С. — племя лепча. З 13 ст. тут з'явіліся выхадцы з Тыбета — бхотыя. З 16 ст. на тэр. С. пашырыўся будызм у форме ламаізму. У пач. 17 ст. склалася саманад. княства С. на чале з правіцелямі (чаг'ялами) тыбецкага паходжання, якое было ў васальнай залежнасці ад Тыбета. У пач. 19 ст. падпарадкаваны Вялікабрытаніяй. З 1861 С. — брыт. пратэктарат (афіцыйна пацверджана англа-кіт. канвенцыяй 1890), а пасля заваявання Індыяй незалежнасці (1949) — інд. пратэктарат. Шматлікія паўстанні супраць дэспатычнай улады чаг'ялаў прымусілі Індыю ў 1974 увесці ў С. свае войскі. Была абрана Нац. асамблея С. У крас. 1975 на рэферэндуме большасць яго насельніцтва ўхваліла далучэнне С. да Індыі. З мая 1975 С. — 22-гі штат Індыі. *В.У.Адзярыха (гісторыя).*

СІКІРЫЦКІ (Sikirycki) Ігар (31.7.1920, г. Брэст — 2.1.1985), польскі пісьменнік, перакладчык. Вучыўся ў Люблінскім і Лодзінскім ун-тах. Жыў і працаваў у Лодзі на радыё, у т-рах сатыры і «Арлекін» (1945—67). Друкаваўся з 1944. Аўтар паэт. зб-каў «Кліканне дрэў» (1950), «Забаўкі і эпіграмы» (1959), «Асцярожна, свежанапісанае» (1963), «Начны ўлоў» (1966), аповесці «Сямёра адсутных» (1970), кніг для дзяцей. На польскую мову пераклаў асобныя вершы Я.Купалы, Я.Коласа, А.Куляшова, У.Жылкі, М.Аўрамчыка. Укладальнік, аўтар прадмовы і перакладчык многіх твораў у зб. М.Танка «Выбраныя вершы» (1974). З груз. пераклаў паэму «Віцязь у тыгравай шкуры» Ш.Руставелі, з арм. — нар. эпас «Давід Сасунскі». На бел. мову яго вершы перакладалі Р.Барадулін, Н.Гілевіч, М.Танк. *А.Л.Верабей.*

СІКО́З (грэч. sycōsis пакрыванне болькамі) з в ы ч а й н ы, гнойнае запаленне *фалікулаў* валасоў у вобласці вусоў, барады і броваў. Узбуджальнік — залацісты стафілакок. Прыкметы: дробныя вузельчыкі з гнойнай галоўкай, пранізаныя воласам; скура вакол іх ушчыльняецца, пакрываецца коркамі. Лячэнне тэрапеўтычнае. *М.З.Ягоўдзік.*

СІКО́КУ, востраў на Пд Японскага архіпелага, у Японіі. Пл. 17,8 тыс. км². Каля С. 300 дробных астравоў і скал (разам з імі пл. 18,8 тыс. км²). Абмываецца Ціхім ак., Унутраным Японскім м., шматлікімі пралівамі. Даўж. берагавой лініі каля 1800 км. Паўн.-зах. і паўд.-ўсх. берагі расчлянёны слаба, паўн.-ўсх. і паўд.-зах. моцна парэзаны бухтамі. Пераважаюць горы. На Пн ланцуг узгоркаў і нізкагор'яў, складзеных у асн. з гранітаў; на Пд і ў цэнтр. ч. горы выш. да 1981 м (г. Ісідзуты), пераважна са сланцаў. Радовішча меднай руды (Бесіяма). Клімат субтрапічны, мусонны, частыя тайфуны. Ападкаў да 3000 мм за год. Вечназялёныя шыракалістыя лясы. Вырошчваюць рыс, цукр. трыснёг, цытрусавыя; сады. Рыбалоўства. Буйн. гарады: Мацуяма, Такамацу, Такусіма, Коты.

СІКО́РА Іван Паўлавіч (7.9.1885, в. Малыя Алашкі Шаркаўшчынскага р-на Віцебскай вобл. — 26.9.1966), бел. селекцыянер-аматар, паслядоўнік І.У.Мічурына. Займаўся гібрыдызацыяй і адборам пладова-ягодных і дэкар. культур. Вывеў каля 500 сартоў яблыні (найб. вядомы названы яго імем «Памяць Сікоры»), каля 100 — груш, 70 — сліў, сарты ляшчыны, бэзу, руж і інш.

СІКО́РСКІ Ігар Іванавіч (6.6.1889, Кіеў — 26.10.1972), вучоны і авіяканструктар, адзін з піянераў авіябудавання. Чл. Нац. інжынернай акадэміі ЗША (1968). Скончыў Марскі кадэцкі корпус у Пецярбургу (1906). Вучыўся ў тэхн. школе Дзювіньё дэ Лано (Францыя), з 1907 у Кіеўскім політэхн. ін-це. У 1909 пабудаваў і выпрабаваў першы ў Расіі верталёт. На самалёце С-6 устанавіў сусветны рэкорд скорасці палёту з 2 пасажырамі (1911). З 1912 гал. канструктар авіяц. аддзела Руска-Балт. вагоннага з-да, дзе пабудаваў ваенныя і трэніровачныя мана- і біпланы, гідрасамалёт С-15. Стварыў 4-маторныя самалёты «Рускі віцязь» (1913) і «Ілья Мурамец» (1914). У 1918 эмігрыраваў у Францыю. З 1919 у ЗША, дзе ў 1923 адкрыў самалётабудаўнічую фірму «Сікорскі аэраінжынірынг карпарэйшн», распрацаваў

шматмесныя самалёты-амфібіі (1928), серыйныя пасажырскія авіялайнеры для трансакіянскіх перавозак (1934). З 1938 будаваў верталёты. У ЗША С. стварыў 17 базавых тыпаў пасажырскіх і ваенных самалётаў, 18 тыпаў верталётаў. Яго імем названы аэрапорт у г. Брыджпарт (ЗША), кратэр на адваротным баку Месяца.

Тв.: Воздушный путь. М., 1998.
Літ.: Катышев Г.И., Михеев В.Р. Крылья Сикорского. М., 1992.

М.М.Касцюковіч.

С.І.Сікорскі.

СІКО́РСКІ Сяргей Іванавіч (11.9.1907, г. Бабруйск Магілёўскай вобл. — 28.4.1960), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыят. падполля і партыз. руху на Беларусі, Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Вышэйшую камуніст. с.-г. школу Беларусі (1937), Вышэйшыя курсы палітсаставу (1941), ВПШ пры ЦК ВКП(б) (1949). З 1930 на парт. і сав. рабоце, са снеж. 1939 сакратар Брэсцкага абкома КП(б)Б. У Вял. Айч. вайну з 1941 арганізатар партыз. руху на Віцебшчыне, з ліст. 1942 упаўнаважаны ЦК КП(б)Б па Брэсцкай вобл., з крас. 1943 сакратар Брэсцкага падп. абкома КП(б)Б, камандзір Брэсцкага партыз. злучэння. Пасля вайны сакратар Баранавіцкага абкома КП(б)Б, нам. міністра сельскай гаспадаркі БССР, 1-ы сакратар Магілёўскага абкома КПБ, міністр унутр. спраў БССР. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1951—54, Вярх. Савета СССР з 1954. Чл. ЦК КПБ з 1952.

СІКО́РСКІ (Sikorski) Уладзіслаў (20.5.1881, Тушаў-Нарадовы, каля г. Мелец, Польшча — 4.7.1943), польскі ваен. і дзярж. дзеяч. Ген. броні (1940). Скончыў настаўніцкую семінарыю ў г. Жэшаў (1902), Львоўскі політэхн. ін-т (1908). З 1902 удзельнічаў у польскім нац.-вызв. руху. У 1-ю сусв. вайну адзін са стваральнікаў *легіёнаў польскіх* у Галіцыі (Аўстра-Венгрыя), з 1918 у Войску Польскім. Удзельнік польска-сав. вайны 1919—20 на тэр. Беларусі (камандаваў Палескай брыгадай, 5-й і 3-й арміямі). У 1921—22 нач. Генштаба. У снеж. 1922 — маі 1923 прэм'ер-міністр і міністр унутр. спраў Польшчы. З 1923 ген. інспектар пяхоты, у люг. 1924 — ліст. 1925 міністр вайск. спраў. Выступаў за знешнепаліт. арыентацыю Польшчы на Францыю. Памяркоўна ставіўся да нац. меншасцей, у т.л. беларусаў. У 1925—28 камандаваў войскамі ваен. акругі (Львоў). Пасля ваен. перавароту Ю.Пілсудскага 1926 адхілены ад гэтай пасады (1928). Быў апанентам *«санацыйнага рэжыму»*. У 2-ю сусв. вайну прэм'ер-міністр і міністр вайск. спраў (з 30.9.1939) *польскага ўрада ў эміграцыі* (у Францыі, з чэрв. 1940 у Вялікабрытаніі), адначасова вярх. галоўнакамандуючы і генеральны інспектар узбр. сіл (з 7.11.1939). Імкнуўся да перамогі над нацысцкай Германіяй у саюзе з зах. краінамі (пасля 22.6.1941 і з СССР) і аднаўлення незалежнай польск. дзяржавы з даваен. усх. мяжой. Адзін з першых палітыкаў на Захадзе, які прапанаваў адкрыццё другога фронту. У ліп. 1941 заключыў *савецка-польскае пагадненне 1941*, паводле якога з польскіх ваеннапалонных і б. жыхароў Зах. Беларусі і Зах. Украіны створана *Андэрса армія*, а ў час свайго афіц. візіту ў СССР (снеж. 1941) падпісаў Дэкларацыю аб сяброўстве і ўзаемнай дапамозе з СССР (Дэкларацыя С. — Сталіна). Загінуў у авіякатастрофе каля Гібралтара пры нявысветленых абставінах. Аўтар шэрагу прац па пытаннях ваен. і дзярж. палітыкі міжваен. Польшчы.

Літ.: Климковский Е. Я был адъютантом генерала Андерса: Пер. с пол. М., 1991; Парсаданова В.С. Владислав Сикорский // Вопр. истории. 1994. № 9; Terlecki O. Władysław Sikorski. Wrocław etc., 1985.

Ю.В.Грыбоўскі.

СІКО́РСКІ Усевалад Міхайлавіч (10.10.1923, в. Хутар Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл. — 22.12.1981), бел. гісторык і філосаф. Чл.-кар. АН Беларусі (1972), д-р філас. н. (1967), праф. (1967). Засл. дз. нав. Беларусі (1971). Скончыў БДУ (1949), Рэсп. парт. школу (1948). З 1944 супрацоўнік Бел. дзярж. музея гісторыі Вял. Айч. вайны, з 1948 на журналісцкай працы, з 1953 у БДУ (з 1961 заг. кафедры, адначасова ў 1972—78 рэктар, гал. рэдактар зб. «Пытанні гісторыі КПСС»). Аўтар прац па праблемах міжнар. камуніст. руху, гісторыі КПСС, адзін з аўтараў «Курса лекцый па гісторыі КПСС» (ч. 1—2, 1971). Дэп. Вярх. Савета БССР у 1975—80.

Тв.: Мировой революционный процесс и современный социал-реформизм. Мн., 1965; Карл Маркс — великий учитель и вождь пролетариата. Мн., 1968; КПСС на этапе развитого социализма. Мн., 1975; Партия класса, партия народа. Мн., 1980.

У.К.Коршук.

СІКСЦІ́НСКАЯ КАПЭ́ЛА, гл. *Рымская Сіксцінская капэла.*

СІ́КХІ (на мове хіндзі сікх — вучань), паслядоўнікі *сікхізму*. У канцы 18 ст. стварылі ў *Пенджабе* ўласную дзяржаву, якая была знішчана англічанамі ў 1849 (гл. *Англа-сікхскія войны*). Зараз складаюць большасць насельніцтва інд. штата Пенджаб і значную ч. насельніцтва штата Утаранчал-Прадэш; асобныя абшчыны С. раскіданы па ўсёй Індыі, пераважна ў гарадах. У выніку міграцыі за мяжу абшчыны С. узніклі таксама ў Паўд.-Усх. Азіі, Усх. і Паўд. Афрыцы, у апошнія дзесяцігоддзі ў ЗША.

СІКХІ́ЗМ (ад *сікхі*), рэлігія, якая ўзнікла ў 16 ст. ў Паўн.-Зах. Індыі. Засн. ў Пенджабе гуру Нанакам. Пасля яго смерці пропаведзь С. працягвалі 9 гуру (усе яны лічацца пераўвасабленнямі Нанака). Спалучае рысы *індуізму* і *ісламу*. Паслядоўнікі С. (сікхі) адмаўляюць індуісцкую ідэю мнагабожжа, вераць у адзінага Бога, які ўвасабляе ў сабе Тварца, Захавальніка і Разбуральніка. Спасціжэнне Бога сікхі лічаць магчымым для кожнага чалавека, які прытрымліваецца шляху любові, веры, адданасці і разважанняў аб божых дзеяннях. С. адмаўляе каставую сістэму, складаную абрадавасць, аскетызм і пустэльніцтва. Свяшчэнная кніга сікхаў Адыгрантх (санскр. «спрадвечная кніга») аб'ядноўвае гімны 10 гуру С., а таксама гімны Кабіра (15 ст.), Намдзева (15 ст.), Фарыда (13 ст.), Джаядзевы (14 ст.) і інш. прадстаўнікоў індуізму і *суфізму*. Адмаўленне каставай сістэмы забяспечыла папулярнасць С. сярод сялян і рамеснікаў. У пач. 18 ст. ідэалогія С. паслужыла асновай для барацьбы супраць імперыі Вялікіх Маголаў. У 1765 сікхі стварылі незалежную дзяржаву, у 1849 у выніку *Англа-сікхскіх войнаў* страцілі незалежнасць. У сучаснай Індыі С. прытрымліваюцца каля 2% насельніцтва (пераважна штат Пенджаб). Рэліг. цэнтр С. — г. Амрытсар, дзе ў «Залатым храме» захоўваецца кніга Адыгрантх.

Літ.: Семенова Н.И. История сикхского движения в Индии. М., 1963; Бельский А.Г., Фурман Д.Е. Сикхи и индусы: Религия, политика, терроризм. М., 1992; Индуизм. Джайнизм. Сикхизм: Словарь. М., 1996; Гуру Нанак. Джап джи: Пер. с инд. // Всемир. лит. 1999. №8.

СІ́ЛА, адна з трох першапачатковых карэйскіх дзяржаў (*Кагуро*, *Пэкчэ* і С.) у 1 ст. да н.э. — 7 ст. н.э., у 7—9 ст. першая агульнакар. дзяржава. Спачатку займала ПдЗ Карэйскага п-ва. Паводле летапісных паказанняў, засн. ў 57 да н.э., хаця першыя звесткі пра С. адносяцца да 3 ст., калі яна ўяўляла саюз паўн.-зах. кар. плямён. Як дзяржава аформілася да пач. 6 ст. У 503 правіцель (марыпкан) Чыджын [500—514] прыняў тытул цара (вана), а дзяржава — назву С. Фарміравалася пад моцным уплывам кіт. культуры і *канфуцыянства*. У 6 ст. дзярж. рэлігіяй стаў *будызм*. Сумесна з войскамі кіт. дынастыі *Тан* С. ў 660 разбіла Пэкчэ, у 668 — Кагуро, потым выгнала з Карэі былых саюзнікаў — кітайцаў. У 8 — пач. 9 ст. у час росквіту С. як агульнакар. дзяржавы сфарміравалася кар. народнасць. З сярэдзіны 9 ст. С. пачала занепадаць і ў канцы 9 ст. распалася на асобныя дзяржавы.

Літ.: История Кореи. Т. 1. М., 1974.

СІ́ЛА ў механіцы, вектарная фіз. велічыня, якая вызначае меру мех. ўзаемадзеяння цел; адна з асн. дынамічных характарыстык. Паводле 2-га закону Ньютана С. $\vec{F} = m\vec{a}$, дзе $\vec{m}$ — маса цела і $\vec{a}$ — паскарэнне, з якім яно рухаецца.

Дзеянне С. на цела выклікае змену скарасцей яго пунктаў (узнікае паскарэнне) або дэфармацыю і можа адбывацца як пры непасрэдным кантакце матэрыяльных аб'ектаў (С. трэння, С. ціску, удар), так і паміж аддаленымі целамі пры дапамозе поля (гл. *Поле фізічнае*). У кожны момант часу С. характарызуецца модулем (лікавым значэннем), напрамкам (лініяй дзеяння) і пунктам прыкладання; складанне С. праводзіцца паводле правіла паралелаграма. Пры непасрэдным выкарыстанні паняцця «С.» фармулююцца многія фіз. законы: *Ампера закон*, *Гука закон*, *Кулона закон* і інш., а таксама вызначаюцца важныя фіз. велічыні: *імпульс сілы*, *момант сілы*, *работа*, *энергія* і інш. Модуль С. вымяраецца дынамометрам. Адзінка С. ў СІ — *ньютан*. *А.І.Болсун.*

СІ́ЛА ВЫПРАМЯНЕ́ННЯ, прасторава-вуглавая шчыльнасць *патоку выпрамянення*. С.в. роўная адносінам патоку выпрамянення, якое распаўсюджваецца ад кропкавай крыніцы ўнутры прасторавага вугла, да лікавага значэння гэтага вугла. Адзінка С.в. ў СІ — ватастэрадыян. У сістэме светлавых велічынь аналагам С.в. з'яўляецца *сіла святла*.

СІ́ЛА ГУ́КУ, тое, што *інтэнсіўнасць гуку*.

СІ́ЛА ІНЕ́РЦЫІ, вектарная фіз. велічыня, лікава роўная здабытку масы матэрыяльнага пункта (часціцы) на модуль яго паскарэння і накіраваная процілегла паскарэнню.

Пры крывалінейным руху часціцы адрозніваюць датычную С.і. $\vec{F}_\tau = -m\vec{a}_\tau$ і нармальную (цэнтрабежную) С.і. $\vec{F}_n = -m\vec{a}_n$, дзе m — маса часціцы, $\vec{a}_\tau$ — *тангенцыяльнае паскарэнне*, $\vec{a}_n$ —*нармальнае паскарэнне*. Ураўненне часціцы адносна *неінерцыяльнай сістэмы адліку* мае выгляд $m\vec{a}_{ад} = \vec{F} + \vec{F}_{пер} + \vec{F}_{кар}$, дзе $\vec{F}$ — раўнадзейная ўсіх знешніх сіл, што дзейнічаюць на часціцу; $\vec{F}_{пер} = -m\vec{a}_{пер}$ — пераносная С.і.; $\vec{a}_{ад}$ і $\vec{a}_{пер}$ — адноснае і пераноснае паскарэнні (гл. *Адносны рух*), $\vec{F}_{кар}$ — *Карыяліса сіла*. С.і. прапарцыянальная масе і таму нагадвае гравітацыйную сілу (сілу прыцягнення), што дазваляе параўноўваць рух часціцы адносна неінерцыяльнай сістэмы адліку з яе свабодным рухам у дадатковым («эквівалентным») гравітацыйным полі (гл. *Эквівалентнасці прынцып*). *А.І.Болсун.*

СІ́ЛА СВЯТЛА́, фізічная велічыня, якая характарызуе свячэнне крыніцы бачнага выпрамянення ў зададзеным напрамку; адна з асн. светлавых велічынь. С.в. роўная адносінам *светлавога патоку*, які распаўсюджваецца ад кропкавай крыніцы ўнутры элементарнага прасторавага вугла ў зададзеным напрамку, да лікавага значэння гэтага вугла. Адзінка С.с. ў СІ — *кандэла*.

СІ́ЛА ТО́КУ, скалярная фіз. велічыня, якая вызначае скорасць праходжання эл. зараду ў эл. ланцугу; адна з асн. характарыстык *электрычнага току*. С.т. роўная адносінам эл. зараду dq да інтэрвалу часу dt, за які гэты зарад перанесены праз папярочнае сячэнне правадніка: $i = dq/dt$. Для вымярэння С.т. карыстаюцца *амперметрамі*. Адзінка С.т. ў СІ — *ампер*.

СІ́ЛА ЦЯЖА́РУ, сіла, якая дзейнічае на кожны матэрыяльны пункт, што знаходзіцца паблізу паверхні Зямлі, і роўная геам. суме сілы прыцягнення Зямлі і цэнтрабежнай *сілы інерцыі*. Напрамак С.ц. — вертыкаль у дадзеным пункце зямной паверхні. Аналагічна вызначаюцца С.ц. на кожнай планеце Сонечнай сістэмы.

СІЛА́БА-ТАНІ́ЧНАЕ ВЕРШАСКЛАДА́ННЕ (грэч. syllabē склад + tonos націск), сістэма вершаскладання, засн. на мерным чаргаванні націскных і ненаціскных складоў у паэтычным радку. Характэрна мовам з нефіксаваным націскам (бел., рус., укр., англ., ням. і інш.). У бел. паэзіі зараджэнне С.-т.в. як сістэмы адносіцца да канца 18 — пач. 19 ст. («Уваскрэсенне Хрыстова», «Энеіда навыварат», «Тарас на Парнасе»):

Прайшоў вёрст дзевяць тэй дарогай,
Аж бачу я — гара стаіць;
Пад тэй гарой народу многа,
Як бы кірмаш які кіпіць.

(«Тарас на Парнасе»).

У творчасці паэтаў 19 ст. (Ф.Багушэвіч, Я.Лучына, А.Гурыновіч і інш.) пад уплывам нар. танічнага верша (гл. *Танічнае вершаскладанне*), рус. і ўкр. паэзіі адбывалася дэфармацыя форм сілабічнага верша (гл. *Сілабічнае вершаскладанне*) і набліжэнне іх да С.-т.в. У пач. 20 ст. гэты працэс завяршыўся станаўленнем класічных форм бел. верша. Дзякуючы творчасці Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча С.-т.в. стала пануючым ў бел. л-ры.

Рытм у сілаба-танічным вершы ўтвараюць радкі, у якіх мерна паўтараюцца націскныя і ненаціскныя склады. Сілаба-танічны верш мае стапу — метрычную адзінку з адным націскным і адным або двума ненаціскнымі складамі. У С.-т.в., найб. пашыраны 4-стопныя («Родны хлеб» П.Глебкі) і 5-стопныя («Маёй рукой пасаджанай бярозе...» А.Куляшова), найменш — 1-стопныя («Зімовыя малюнкі» П.Броўкі) і 2-стопныя («Лета» Р.Барадуліна) радкі. Вершы, радкі якіх складаюцца больш чым з 6 стоп, сустракаюцца вельмі рэдка («Паэты рэвалюцыі» А.Дудара). Некат. шматстопныя памеры атрымалі (па аналогіі з ант.) сваю назву: *александрыйскі верш* («Летапісец» Багдановіча), *гекзаметр* («Дзень гневу» А.Дудара, «Гекзаметры» У.Жылкі), *пентаметр* («Чорныя рукі» М.Рудкоўскага, «Пентаметры» Жылкі). Найчасцей у сілаба-танічных вершах адзін і той жа памер захоўваецца ва ўсіх радках («Мора» Цёткі, «Чырваніць, чырваніць...» Броўкі). Ёсць творы, у якіх спалучаюцца радкі рознай даўжыні, што разнастаіць іх рытм («Жаба ў каляіне» К.Крапівы). Сэнсавыяўленчыя, інтанацыйныя магчымасці сілаба-танічнага верша пашыраюць і інш. рытмаўтваральныя кампаненты — ужыванне разнастайных строф, рыфмаў, цэзуры. С.-т.в. — асноўная сістэма вершаскладання сучаснай усх.-слав., у т.л. бел., вершатворчасці.

Літ.: Лазарук М.А., Лянсу А.Я. Пытанні тэорыі літаратуры. Мн., 1964; Ралько І.Д. Беларускі верш. Мн., 1969; Грынчык М.М. Шляхі беларускага вершаскладання. Мн., 1973. *А.А.Майсейчык.*

СІЛАБІ́ЧНАЕ ВЕРШАСКЛАДА́ННЕ (ад грэч. syllabē склад), сістэма вершаскладання, заснаваная на аднолькавай колькасці складоў у паэтычных радках. Характэрна для моў з пастаянным націскам (франц., польскай, чэшскай і інш.). Рытмаўтваральную ролю ў С.в. адыгрывае таксама *цэзура* і метрычная *канстанта*. Найб. дасканаласці С.в. дасягнула ў франц. і італьян. паэзіі 11—12 ст. У 15 ст. засвоена польскай л-рай. Бел. С.в. пачало фарміравацца ў пач. 16 ст. Адзін з першых бел. сілабічных вершаў — з прадмовы Ф.Скарыны да кн. «Іоў» (1517):

Богу в троици единому ко чти и ко славе,
Матери его пречистой Марии к похвале,
Всем небесным силам и святым его к веселию,
Людем посполитым к доброму научению.

У вершы яшчэ не вытрыманы ўсе адзнакі сілабікі, але ён вызначаецца строгай рэгламентаванасцю радка, выдзяленнем яго сэнсава-інтанацыйных частак паўзамі, спалучэннем радкоў парнай рыфмай. Бел. паэты 16—17 ст. А.Рымша, Я.К.Пашкевіч, Афанасій Філіповіч і інш. ўдасканалілі форму сілабічнага верша, наблізілі яе да класічных узораў. Майстар сілабічнага верша ў бел. паэзіі 1-й пал. 17 ст. — Сімяон Полацкі, творам якога ўласцівы ўсе вызначальныя адзнакі сілабікі:

Паче нетерпимую / смерть себе избрати,
Неже оскверненную / плоть свою предати.

(«Паклёп»).

У 1664 Сімяон Полацкі пераехаў у Маскву, дзе паклаў пачатак рус. С.в., якое праіснавала да 1-й трэці 18 ст. (выйшла з ужытку ў выніку рэформы В.Тредзьякоўскага—М.Ламаносава).

У бел. паэзіі С.в. сустракалася да 19 ст. Сярод яго прадстаўнікоў Я.Баршчэўскі («Дзеванька»), Я.Чачот («Да мілых мужычкоў»), В.Дунін-Марцінкевіч («Халімон на каранацыі»), Ф.Багушэвіч («У судзе») і інш. Бел. сілабічная паэзія 19 ст. вызначалася разнастайнасцю памераў: 15-складовік («Вечарынка» Ф.Тапчэўскага), 14-складовік («Верш Навума Прыгаворкі»), 13-складовік («Ідылія») і 12-складовік («Халімон на каранацыі»; усе Дуніна-Марцінкевіча), 11-складовік («Пакуль новы год настане» Я.Лучыны). Назіралася тэндэнцыя да 7- і 8-складовікаў («Купала» Дуніна-Марцінкевіча). Уплыў рус. сілаба-танічнага верша, а таксама сілаба-танічных форм нар. верша на бел. літ. сілабіку прывёў да яе паступовага адмірання. З канца 19 — пач. 20 ст. бел. С.в. саступіла месца *сілаба-танічнаму вершаскладанню* і *танічнаму вершаскладанню*.

Літ.: Гл. да арт.: *Сілаба-танічнае вершаскладанне*. *А.А.Майсейчык.*

СІЛАВА́Я ПЕРАДА́ЧА, разнавіднасць *перадачы*, якая служыць для перадачы мех. энергіі (руху) ад рухавіка да яе спажыўца з павелічэннем вярчальных момантаў (за кошт змяншэння скорасці, частаты вярчэння) або для змены характару руху. У *прыводах* машын дазваляе ўзгадняць рэжым работы рухавіка і выканаўчых (рабочых) органаў, ажыццяўляць змену напрамку руху (рэверсаванне, або *рэверс*), ператвараць вярчальны рух у паступальны, вінтавы і інш. С.п. бываюць мех. (найб. пашыраны *зубчастыя перадачы*, *ланцуговыя перадачы*, *раменныя перадачы*, *фрыкцыйныя перадачы*, *чарвячныя перадачы*), *гідраўлічныя перадачы*, пнеўматычныя і інш. У некат. машынах С.п. наз. трансмісіяй.



Тэкстронная **сілавая перадача**.

СІЛАВО́Е ПО́ЛЕ, частка прасторы (абмежаваная ці неабмежаваная), у кожным пункце якой на змешчаны там матэрыяльны пункт (часціцу) дзейнічае вызначаная *сіла*. Характарыстыкі С.п. могуць залежаць толькі ад каардынат (стацыянарнае С.п.), ад каардынат і часу (нестацыянарнае С.п.) ці мець пастаяннае значэнне ва ўсіх пунктах С.п. (аднароднае С.п.), незалежнае ад каардынат і часу.

С.п., у якім *работа* сіл поля, што дзейнічаюць на рухомую часціцу, залежыць толькі ад пачатковага і канцавога месцазнаходжанняў гэтай часціцы і не залежыць ад віду яе траекторыі, наз. патэнцыяльным, кожны пункт якога характарызуецца пэўным значэннем *патэнцыялу*. Напр., гравітацыйнае поле, *электрамагнітнае поле*. Работу сіл такога поля можна выразіць праз *патэнцыяльную энергію* часціцы $U(x, y, z)$: $A = U(x_1, y_1, z_1) - U(x_2, y_2, z_2)$, дзе x_1, y_1, z_1 і x_2, y_2, z_2 — каардынаты пачатковага і канцавога пунктаў траекторыі часціцы адпаведна. Гл. таксама *Поле фізічнае*.

СІЛАВЫ́ КА́БЕЛЬ, гл. ў арт. *Кабель*.

СІЛАГІ́ЗМ (ад грэч. syllogismos разлічваю, заключаю), від дэдуктыўнага *розумазаключэння*, у якім з 2 суджэнняў (пасылак), звязаных паміж сабою адным агульным сярэднім тэрмінам, атрымліваюць трэцяе суджэнне. У залежнасці ад пасылак адрозніваюць катэгарычны, раздзяляльна-катэгарычны і ўмоўна-катэгарычны С. У катэгарычным С. вывад атрымліваецца з 2 пасылак, якія з'яўляюцца катэгарычнымі суджэннямі: А ёсць В, В ёсць С, значыць А ёсць С. У раздзяляльна-катэгарычным С. ў большай пасылцы пералічваецца некалькі магчымых рашэнняў, у меншай адмаўляюцца ўсе, акрамя аднаго: А ёсць або В, або С, або D, але А не ёсць ні В, ні D, значыць А ёсць С. Ва ўмоўна-катэгарычным С. хаця б адна з 2 пасылак з'яўляецца ўмоўным суджэннем: Калі А ёсць В, то С ёсць D; А ёсць В, значыць С ёсць D. У залежнасці ад становішча сярэдняга тэрміна адрозніваюць 4 фігуры С. Кожная з іх мае па некалькі модусаў (С., якія адрозніваюцца адзін ад аднаго колькасцю і якасцю суджэнняў). Усяго існуе 256 модусаў; правільнымі, якія даюць ісціннае заключэнне, лічацца толькі 24 (гл. *Сілагістыка*). Вывад аднаго С. можа быць пасылкай наступнага. Такім чынам ствараецца складаны С., або полісілагізм. Гл. таксама *Сілагізма аксіёма*.

В.М.Пешкаў.

СІЛАГІ́ЗМА АКСІЁМА, асноўны прынцып катэгарычнага сілагізма, што адносіцца і да аб'ёму і да зместу паняццяў. Для аб'ёму паняццяў С.а. фармулюецца так: усё, што сцвярджаецца (адмаўляецца) адносна ўсіх прадметаў класа, тое сцвярджаецца (адмаўляецца) і адносна любога прадмета гэтага класа; для зместу паняцця — ацэнка прыкметы прадмета ёсць таксама ацэнка самога прадмета; тое, што супярэчыць прыкмеце прадмета, супярэчыць і самому прадмету. Гл. таксама *Сілагізм*.

СІЛАГІ́СТЫКА (ад грэч. syllogistikos які робіць вывад), раздзел *логікі*, які вывучае дэдуктыўныя *розумазаключэнні*, што складаюцца толькі з катэгарычных суджэнняў. Уключае класіфікацыю розумазаключэнняў у залежнасці ад пасылак, якія ўваходзяць у яго, а таксама ад становішча сярэдняга тэрміна — фігуры *сілагізма*. Адрозніваюць 4 фігуры: агульнасцвярджальную («усякае А ёсць Б»), агульнаадмоўную («ні адно А не ёсць Б»), прыватнасцвярджальную («некаторае А ёсць Б»), прыватнаадмоўную («некаторае А не ёсць Б») і 256 варыянтаў фігур (правільных 24) — модусаў. У такім выглядзе С. распрацавана стараж.-грэч. філосафам *Арыстоцелем*, які ўвёў літарныя сімвалы для абазначэння суджэнняў і іх тэрмінаў, класіфікаваў і абгрунтаваў розныя формы сілагізмаў (модусы). Сучасная *матэматычная логіка* скараціла колькасць модусаў да 15, адкінуўшы тыя, што супярэчаць правілам выводу.

В.М.Пешкаў.

СІ́ЛАНПЯ (Sillanpää) Франс Эміль (16.9.1888, г. Хяменкюрэ, Фінляндыя — 3.6.1964), фінскі пісьменнік. Вучыўся ў Хельсінкскім ун-це (1908—13), працаваў у выдавецтвах (1915—26). У першым рамане «Сонца і жыццё» (1916), зб-ках навел «Дзеці чалавечыя ў каравдзе жыцця» (1917), «Мая ўлюбёная радзіма» (1919), «Ад зямлі» (1924), «Тэлінмякі» (1925) адчувальныя ўплывы творчасці неарамантыкаў (Ю.*Аха*, К.*Гамсун*). У рамане «Праўдзівая беднасць» (1919),

Ф.Э.Сіланпя.

аповесці «Хілту і Рагнар» (1923) псіхал. асэнсаванне стану фін. сялянства ў час і ў першыя гады пасля грамадз. вайны 1918. У раманах «Памерлая ў маладосці» (1931), «Шлях мужчыны» (1932), «Людзі ў летняй ночы» (1934) паглыбленне псіхалагізму, узмацненне рэаліст. тэндэнцый. Аўтар аўтабіягр. раманаў «Жнівень» (1941), «Хлопец жыў сваім жыццём» (1953), «Расказваю і выяўляю» (1954), «Галоўная падзея дня» (1956) і інш. Нобелеўская прэмія 1939.

Тв.: Рус. пер. — Праведная бедность. М., 1964; Люди в летней ночи: Избр. проза. М., 1992; Усопшая в молодости // Бьернсон Б. Избр. произв.; Силланпяя Ф.Э. Усопшая в молодости. М., 1999.

Л.П.Баршчэўскі.

СІЛА́НЦЬЕЎ Юрый Васілевіч (10.4.1919, г. Краснадар, Расія — 20.12.1983), расійскі дырыжор, кампазітар. Нар. арт. СССР (1975). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1940). З 1948 скрыпач-канцэртмайстар і асістэнт дырыжора Маскоўскага сімф. аркестра. З 1958 маст. кіраўнік і гал. дырыжор створанага ім эстрадна-сімф. аркестра Цэнтр. тэлебачання і радыёвяшчання. Аўтар муз. твораў розных жанраў: рапсодыя «Адыгейскі зафак» (1973), «Камсамольская сімфонія» (1976), балет «Юнацтва» (1976—77) і інш.

Л.А.Шымановіч.

СІЛА́НЫ, крэменевадароды, група хім. злучэнняў *крэмнію* з вадародам агульнай ф-лы Si_nH_{2n+2} ($n = 1$—8); аналагі алканаў (гл. *Насычаныя злучэнні*). Ланцугі, утвораныя атамамі крэмнію няўстойлівыя; вышэйшы вядомы член гомалагічнага раду С. — октасілан Si_8H_{18}.

Монасілан SiH_4 ($t_{кіп}$ -112 °С, шчыльн. 680 кг/м^3) і дысілан Si_2H_6 — бясколерныя газы, астатнія — бясколерныя лятучыя вадкасці з непрыемным пахам, атрутныя. Растваральнікі ў этаноле, бензіне, серавугляродзе. Піраформныя (гл. *Піраформныя рэчывы*). Вельмі лёгка акісляюцца (для С. з $n \geq 3$ рэакцыя адбываецца з моцным выбухам) і гідралізуюцца з утварэннем *крэмнію дыаксіду* і вадароду. Монасілан атрымліваюць раскладаннем трыэтаксісілану $(C_2H_5O)_3SiH$ пры 20—80 °С у прысутнасці натрыю, астатнія С. — раскладаннем *сіліцыдаў* металаў к-тамі і шчолачамі. Выкарыстоўваюць SiH_4 для атрымання паўправадніковага крэмнію.

СІ́ЛАС (іст. silos, мн. лік ад silo падземнае памяшканне, яма для захоўвання зерня), кансерваваная без доступу паветра зялёная маса раслін, *сакаўны корм*. Сіласуюць *сіласныя культуры*, дзікаслыя травы, бацвінне, караняплоды і інш.

Расліны здрабняюць, закладваюць слаямі ў *сілассховішчы*, утрамбоўваюць і ізалююць ад паветра зямлёй, глінай або сінт. плёнкай. У такіх умовах хутка размнажаюцца *малочнакіслыя бактэрыі*, якія раскладаюць цукры з утварэннем малочнай к-ты і прыгнечваюць анаэробныя маслянакіслыя і гніласныя працэсы. Гатуюць С. просты ці камбінаваны, часам з падвяленых (да 70% вільгаці) раслін. Якасны С. мае прыемны пах (квашанай капусты, мочаных яблык, фруктовы), кіславаты смак, жоўта-зялёны колер, рыхлую структуру, у ім зберагаюцца пажыўныя рэчывы (акрамя цукру) і вітаміны. Уваходзіць у кармавы рацыён с.-г. жывёл, паляпшае іх страваванне, засвойванне інш., асабліва *грубых кармоў*.



Сіласасховішча: 1 — наземнае з жалезабетонных блокаў; 2 — з бутавага каменю; 3 — паўзаглыбленае з цэглы; 4 — з жалезабетонных пліт.

СІЛАСАСХО́ВІШЧА, збудаванне ў выглядзе траншэі або вежы для прыгатавання і захоўвання *сіласу*. Ахоўваюць сіласную масу ад доступу паветра, пранікнення вады і прамярзання.

Будуюцца звычайна на тэр. жывёлагадоўчых або птушкагадоўчых ферм з найкарацейшымі адлегласцямі падачы сіласу для скормлівання. Траншэі бываюць наземныя, паўзаглыбленыя і заглыбленыя, сцены іх звычайна уцяпляюць грунтам, днішчы робяць з нахілам для сцёку вадкасці. Аб'ём 500—4000 м^3. Гл. таксама *Сянажнае сховішча*.

СІЛАСАЎБО́РАЧНЫ КАМБА́ЙН, машына для ўборкі (адначасовага скошвання, здрабнення і пагрузкі ў трансп. сродкі) на *сілас* кукурузы, сланечніку, віка-аўсянай сумесі і інш. культур. Бываюць прычапныя (агрэгатуюцца пераважна з колавымі трактарамі тыпу «Беларусь» і Т-150К, а таксама з гусенічнымі) і самаходныя.

Выкарыстоўваюцца таксама для нарыхтоўкі сенажу, зялёнай падкормкі, травяной мукі. Асн. рабочыя органы: рэжучы апарат (жняярка платформеннага тыпу суцэльнага зрэзу), барабанны здрабняльны апарат, сіласаправод. Для падборкі зялёнай або падсушанай травы з валкоў замест жняяркі манціруюць падборшчык. Для ўборкі сіласных культур выкарыстоўваюць таксама *кормаўборачныя камбайны*. На Беларусі С.к. выпускае з-д «Гомсельмаш».

В.М.Кандрацьеў.

СІ́ЛАСНЫЯ КУЛЬТУ́РЫ, расліны, якія вырошчваюць для прыгатавання *сіласу*. Да іх адносяць расліны, што даюць высокі ўраджай зялёнай масы, багатыя асн. пажыўнымі рэчывамі, паддаюцца механізаванай уборцы і апрацоўцы. На Беларусі асн. С.к.: кукуруза, кармавыя лубін і капуста, сланечнік, віка-аўсяная сумесь, рапс, рэдзька і інш.

СІЛАЭ́ (Siloé) Дыега дэ (каля 1495, г. Бургас, Іспанія — 22.10.1563), іспанскі архітэктар і скульптар. Верагодна, сын і вучань скульпт. Х. дэ Сілаэ. Працаваў у Італіі, дзе зазнаў уплыў *Мікеланджэла* і фларэнційскай школы архітэктуры, з 1519 — пры саборы ў Бургасе («Залатая лесвіца», 1519—23; шэраг надмагілляў). У арх. творах С. (сабор у г. Гранада, з 1528, і інш.) спалучаў гатычныя элементы з ордэрам і рэнесансавымі па духу гарманічнымі прасторавымі пабудовамі. Яго скульпт. работы блізкія да маст. традыцыі Высокага Адраджэння (убранне сабора ў Гранадзе, рэльефы хора касцёла Сан-Бенітa ў Вальядалідзе).

СІЛЕ́ЗІЯ (польск. Śląsk, чэш. Slezsko, ням. Schlesien), гістарычная славянская вобласць у верхнім і сярэднім цячэнні р. Одра (Одэр). Большая частка ў складзе Польшчы (Апольскае, Дольнашлёнскае, Шлёнскае і інш. ваяводствы). Паўд. С. часткова ў складзе Чэхіі (раёны каля граніцы з Польшчай).

Назва С., верагодна, ад сілінгаў — часткі стараж.-герм. племя *вандалаў*, якія жылі тут да 6 ст. н.э. З 6—7 ст. заселена славянамі. У пач. 10 ст. С. ў складзе Чэхіі (дзяржавы *Пржэмыславічаў*), з 990 — Польшчы (дзяржавы *Пястаў*). У 1000 насельніцтва С. прыняло хрысціянства. З 1138 С. — удзельнае княства, у 1163—73 і пасля 1241 раздроблена. З пач. 13 ст. тут сяліліся і ням. каланісты (продкі сілезскіх немцаў). У 1-й пал. 14 ст. зноў увайшла ў Чэхію. З 1526 С. (акрамя Севежскага, Асвенцімскага, Заторскага княстваў) — уладанне аўстр. Габсбургаў. У выніку *Сілезскіх войнаў* (1740—42, 1744—45) і *Сямігадовай вайны 1756—63* большая частка С. ўключана ў склад Прусіі (акрамя княстваў Опава і Цешын, тэр. якіх засталася пад уладай Габсбургаў — т.зв. Аўстрыйская С.). У 1793 і 1844 у рэгіёне адбыліся *Сілезскія паўстанні ткачоў*. У 1919 пруская правінцыя С. (утворана ў 1807) падзелена на правінцыі Верхняя С. з цэнтрам у г. Опельн (Аполе) і Ніжняя С. з цэнтрам у г. Брэслаў (Вроцлаў); тут адбыліся *Сілезскія паўстанні 1919, 1920, 1921*. З 1920 б. Аўстрыйская С. ў складзе Чэхаславакіі. У 1922 Саветам Лігі Нацый каля $^1/_3$ Верхняй С. перададзена Польшчы. У кастр. 1938 (пасля *Мюнхенскага пагаднення 1938* аб падзеле тэр. Чэхаславакіі) польскія войскі занялі Цешынскую С. Пасля 2-й сусв. вайны рашэннем *Патсдамскай канферэнцыі 1945* большая частка С. вернута Польшчы (гэта становішча прызнана герм.-польскім дагаворам аб межах 14.11.1990); у 1946 тут праведзена масавая дэпартацыя сілезскіх немцаў, частка іх вярнулася ў рэгіён у 1950-я і 1970-я г.

У.Я.Калаткоў (гісторыя).

СІЛЕ́ЗСКІЯ ВО́ЙНЫ, назва войнаў Прусіі супраць Аўстрыі за авалоданне *Сілезіяй* (належала Аўстрыі); састаўная частка вайны за *Аўстрыйскую спадчыну*. У выніку 1-й (1740—42) і 2-й (1744—45) С.в. большая частка Сілезіі была захоплена Прусіяй. Спроба Аўстрыі вярнуць Сілезію ў ходзе *Сямігадовай вайны 1756—63* (часам яе наз. 3-й С.в.) была безвыніковай.

СІЛЕ́ЗСКІЯ ПАЎСТА́ННІ 1919, 1920, 1921, узброеныя выступленні палякаў Верхняй Сілезіі (знаходзілася ў складзе Германіі) з мэтай далучэння рэгіёна да адноўленай польскай дзяржавы пасля 1-й сусв. вайны. Паўстанне 1919 пачалося стыхійна 17 жн. і адбывалася пераважна як лакальныя выступленні ў паўд.-ўсх. частцы Верхняй Сілезіі атрадаў падп. *Польскай арганізацыі вайсковай*. Не падтрыманае ўрадам Польшчы, ліквідавана герм. войскамі. Паўстанне 1920 адбылося 18—28 жн. ў сувязі з абвастрэннем у краі міжнац. адносін (антыпольск. акцыі немцаў). Паўстанцы патрабавалі ліквідацыі тут ням. узбр. арг-цый, стварэння «польскай грамадз. аховы» і інш. Яны авалодалі шэрагам паветаў. Пасля прыняцця Міжсаюзніцкай камісіяй дзяржаў, што перамаглі ў 1-ю сусв. вайну, рашэння аб стварэнні змешанай паліцыі, палякі спынілі паўстанне. Паўстанне

Самаходны **сіласаўборачны камбайн**.

1921 (пачалося 3 мая ноччу) было рэакцыяй на неспрыяльныя для мясц. палякаў вынікі плебісцыту 20.3.1921. У ходзе паўстання баставалі 190 тыс. рабочых, з іх 60 тыс. выступілі са зброяй. Паўстанцы авалодалі шэрагам паветаў, утварылі Вярх. ўладу, Выканаўчы к-т і Гал. камандаванне, да канца чэрв. супраціўляліся герм. войскам, што прыбылі сюды. Па патрабаванні Антанты ў сярэдзіне чэрв. — 5 ліп. ваен. сілы паўстанцаў і герм. войскі эвакуіраваны з рэгіёна. С.п. 1919, 1920, 1921 падштурхнулі Савет Лігі Нацый прыняць 12.10.1921 рашэнне аб перадачы Польшчы 29% усёй тэр. Верхняй Сілезіі з 46% насельніцтва.

СІЛЕ́ЗСКІЯ ПАЎСТА́ННІ ТКАЧО́Ў. Паўстанне 1793 адбылося ў сак.—красавіку ў горных акругах Сілезіі (тады ўваходзіла ў склад Прусіі). Пачалося стыхійна ў г. Шомбург, перарасло ў барацьбу супраць прускіх феад.-прыгонніцкіх парадкаў і ахапіла каля 20 тыс. чал. Было жорстка задушана прускімі войскамі. Паўстанне 1844 адбылося 4—6 чэрв. ў горных паселішчах Сілезіі і выклікана празмернай эксплуатацыяй рабочых прадпрымальнікамі-мануфактурыстамі і мясц. памешчыкамі, якія спаганялі з ткачоў падатак за права займацца прамысл. працай. Штуршком да выступлення паслужылі скарачэнне аплаты працы рабочым і пагаршэнне іх становішча з прычыны неўраджаю. Паўстанне задушана.

Н.Сілівановіч. Дзеці ў двары. 1870-я г.

СІЛЕ́ЗСКІЯ ШКО́ЛЫ, дзве літаратурныя школы ў Германіі ў 17 ст. Назва ад цэнтра літ. суполак у сілезскім г. Брэслаў. Заснавальнік першай С.ш. паэт М.Опіц, які першы пачаў пісаць філас. грамадз. лірыку на ням. мове, паслядоўна правёў сілаба-танічную рэформу і напісаў трактат па паэтыцы «Кніга пра нямецкае майстэрства паэзіі» (1624). Ён вызначыў стыль паэтаў гэтай школы, у творчасці якіх рысы барока спалучаліся з элементамі класіцызму, рацыяналізмам і афарыстычнасцю формы (П.*Флемінг*, Ф. фон Логаў). Асн. праблематыка — 30-гадовая вайна, адказнасць чалавека перад часам, айчынай і сабою. Другая С.ш. ўзнікла ў 2-й пал. 17 ст. (К.Г.*Гофмансвальдаў*, Д. фон Лоэнштайн, К.Грыфіус) і належыць да *барока*. Яе стыль адзначаны моцным уплывам *марынізму* і *прэцыёзнай літаратуры*, адметны складанай метафарычнасцю, маляўнічасцю, музычнасцю і вытанчанасцю формы. Асн. тэмы — марнасць быцця і велічнасць чалавечага духу, каханне, а таксама геданізм і эратычныя матывы. Абедзве С.ш. з'явіліся фундаментам класічнай ням. паэзіі.

Літ.: Синило Г.В. Немецкая литература XVII в. // Разумовская М.В., Синило Г.В., Солодовников С.В. Литература XVII—XVIII вв. Мн., 1989. *Г.В.Сініла.*

СІЛІВАНО́ВІЧ Нікадзім Юр'евіч (25.12.1834, в. Цынцавічы Вілейскага р-на Мінскай вобл. — 1919), бел. жывапісец. Акад. Пецярбургскай АМ (1876). Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1859—66), скончыў клас мазаікі (1870) і выкладаў у акадэміі. У 1863 атрымаў званне вольнага мастака і вярнуўся на Беларусь. У 1864 запрошаны Лідскім павятовым праўленнем для афармлення правасл. храмаў. У гэты перыяд пісаў абразы (у т.л. Аляксандра Неўскага, 1864) і партрэты царк. дзеячаў. У 1866 за новыя работы яму прысвоена званне класнага мастака III ступені. У летнія месяцы наведваў радзіму, напісаў карціны «Галава дзяўчынкі», «Партрэт бацькі», «Партрэт яўрэя», «Пастух са Свянцяншчыны», адметныя вастрынёй псіхал. і сац. характарыстык. У 1874 атрымаў званне класнага мастака I ступені. У 1876 разам з І.Лавярэцкім стварыў мазаічную кампазіцыю «Тайная вячэра» для гал. іканастаса Ісакіеўскага сабора ў Пецярбургу. У творчасці С. раскрыўся пераход ад класіцызму да рэалізму. Сярод інш. твораў: «Дзеці ў двары», «У школу», «Мужчынскі партрэт», «Партрэт Русцекайтэ», «Павятовы староста», «Салдат і хлопчык».

Літ.: Дробаў Л.Н. Беларускія мастакі XIX ст. Мн., 1971. *В.А.Трыгубовіч.*

СІЛІКАГЕ́ЛЬ (ад лац. silex крэмень + *гель*), мікрапорыстая белая маса, атрыманая пры высушванні гелю палікрэміевай к-ты; гідрафільны сарбент. Паводле хім. саставу С. — *крэмнію дыаксід* SiO_2 (крэменязём). Таварны С. — паўпразрыстыя або мелападобныя зярняты белага ці жаўтаватага (з-за прымесей) колеру. Мае вял. ўдзельную паверхню, нязначную асабістую каталітычную актыўнасць. Выкарыстоўваюць для асушвання, ачысткі і раздзялення хладонаў, спіртоў, амінакіслот, вітамінаў, антыбіётыкаў і інш., як адсарбент у храматаграфіі, носьбіт для каталізатараў.

СІЛІКА́ТНАЯ ЦЭ́ГЛА, цэгла, атрыманая прасаваннем увільготненай сумесі кварцавага пяску (90—92%) і гашанай вапны (8—10%) з наступнай апрацоўкай у *аўтаклаве*. Па мех. уласцівасцях набліжана да глінянай абпаленай цэглы, але менш вода- і гарачаўстойлівая.

Аўтаклаўная апрацоўка адбываецца пры т-ры 175—190 °С і ціску 0,8—16 МПа, пасля чаго С.ц. 10—12 сут вытрымліваецца на паветры для *карбанізацыі* вапны. Вырабляюць адзінарную (250 × 120 × 65 мм), модульную (250 × 120 × 88 мм), а таксама ў выглядзе пустацелых сілікатных блокаў (250 × 120 × 138 мм). Выкарыстоўваюць для муроўкі вонкавых і ўнутр. канструкцый у надземнай частцы будынкаў з нармальным і вільготным рэжымамі эксплуатацыі. *І.І.Леановіч.*

СІЛІКА́ТНЫ БЕТО́Н, сумесь вапнава-крэменязёмістага вяжучага рэчыва, неарган. запаўняльнікаў і вады; тып *бетону*. Атрымліваюць тэрмаапрацоўкай у аўтаклаве пры т-ры 175—200 °С. Па ўласцівасцях набліжаны да бетону на партландцэменце (гідраўл. вяжучае рэчыва, найб. распаўсюджаны від *цэменту*).

У якасці вяжучага рэчыва ў С.б. выкарыстоўваюць танкамолатыя сумесі паветр. (гідраўл.) *вапны* з матэрыяламі, што маюць крэменязём; запаўняльнікі — прыродныя або штучныя пяскі. Адрозніваюць цяжкія С.б. (шчыльнасць 1800—2200 кг/м^3) для вырабу сценавых панэлей і блокаў, элементаў перакрыццяў, лесвічных маршаў і лёгкія (шчыльнасць 300—1800 кг/м^3) для буд-ва агараджальных канструкцый, у якасці ўцяпляльніка.

І.І.Леановіч.

СІЛІКА́ТНЫ КЛЕЙ, водны раствор сілікату (гл. *Сілікаты*) натрыю ці калію з напаўняльнікамі і мадыфікуючымі дабаўкамі. Выкарыстоўваюць для склейвання паперы і кардону (С.к. канцылярскі), керамікі, шкла і інш. матэрыялаў.

СІЛІКА́ТНЫЯ ФА́РБЫ, суспензіі пігментаў, напаўняльнікаў і інш. дабавак у водным растворы *сілікатаў* шчолачных металаў (шкле вадкім). Для атрымання С.ф. звычайна выкарыстоўваюць каліевае вадкае шкло $K_2O{\cdot}mSiO_2{\cdot}nH_2O$ ($m \geq 3$, $n = 2$—5), шчолача- і святлоўстойлівыя пігменты і напаўняльнікі, пераважна аксіды, гідраксіды і карбанаты цынку, жалеза, алюмінію і тытану, метал. парашкі. Наносяць С.ф. на паверхню пры дапамозе распыляльніка, пэндзля або валіка ў 2—3 слоі. Утвараюць даўтавечныя вогнезасцерагальныя пакрыцці. Выкарыстоўваюць у буд-ве для

вонкавых і ўнутр. работ, некат., т.зв. пратэктарныя, С.ф. для засцярогі ад карозіі метал. вырабаў (труб гарачага і халоднага водазабеспячэння, падводнай часткі карпусоў марскіх суднаў і інш.).

СІЛІКА́ТЫ (ад лац. silex крэмень), солі *крэмніевых кіслот*. У прыродзе пашыраны ў выглядзе мінералаў (гл. *Сілікаты прыродныя*).

Прыродныя С. і іх сінт. аналагі звычайна даволі тугаплаўкія рэчывы ($t_{пл}$ 1000—1300 °С, часам да 2000 °С і вышэй), маюць высокую цвёрдасць (6—8 па шкале Моаса). За выключэннем С. шчолачных металаў практычна нерастваральныя ў вадзе, інертныя ў растворах мінер. кіслот (акрамя фториставадародная к-ты) і шчолачаў. Раскладаюцца расплавамі карбанатаў і гідраксідаў шчолачных металаў. Расплавы многіх С. цвярдзеюць у выглядзе *шкла*. Сінт. С. атрымліваюць награваннем сумесей аксідаў крэмнію і адпаведных металаў, *гідратэрмальным сінтэзам*, асаджэннем з растворaў і газавай фазы, крышталізацыяй з расплаваў. Пры вытв-сці сілікатных матэрыялаў (*цэмент*, шкло, буд. кераміка) звычайна выкарыстоўваюць керамічны, ці абпальны, спосаб сінтэзу — спяканне прыроднай мінер. сыравіны (гліна, кварцавы пясок, тальк і інш.) з карбанатамі (часам з сульфатамі). Сінт. С. выкарыстоўваюць як адсарбенты і носьбіты каталізатараў. С. шчолачных металаў (пераважна калію і натрыю) — у вытв-сці клею, фарбаў (гл. *Сілікатны клей*, *Сілікатныя фарбы*), розных замазак, у мылаварэнні. Гл. таксама *Алюмасілікаты*. *А.П.Чарнякова.*

СІЛІКА́ТЫ ПРЫРО́ДНЫЯ, прыродныя хім. злучэнні, крышт. рашоткі якіх утрымліваюць крэменекіслародныя тэтраэдры SiO_4; клас пародаўтваральных мінералаў. Складаюць больш за 75% аб'ёму зямной кары, каля 95% вывергнутых парод. Уключаюць больш за 700 мінералаў (25% усіх мінер. відаў), у т.л. пародаўтваральныя: *амфіболы*, *палявыя шпаты*, *піраксены*, *слюды* і інш. Паводле тыпаў злучэння SiO_4-тэтраэдраў і ўтварэння крышт. структур вылучаюць С.п.: астраўныя, кальцавыя, ланцужковыя, стужачныя, слаістыя і каркасныя. Паводле саставу падзяляюцца на алюма-, бора-, тытана-, цыркона-, ніобасілікаты і інш. Крышталізуюцца ў манакліннай (да 45%), рамбічнай (20%), трыкліннай (9%), тэтрагональнай (7%), трыгональнай і гексагональнай (10%) і кубічнай (9%) сінганіях. Звычайна белыя, бясколерныя; з прымессю марганцу, жалеза, тытану, медзі, ванадыю і інш. — розных колераў. Бляск шкляны да алмазнага. Шчыльн. 2—6,5 г/см^3. Цв. 1—8. Многія С.п. валодаюць кіслотатрывалаcцю і высокай т-рай плаўлення. Утвараюцца ў магматычных, метамарфічных, метасаматычных пародах, у пегматытах, а таксама пры гідратэрмальных працэсах і выветрыванні. С.п. — руды многіх металаў (нікелю, алюмінію, берылію, літыю, цэрыю, гафнію і інш.), выкарыстоўваюцца ў тэхніцы (слюды, азбест, сіліманіт, кіяніт, алівін, тальк і інш.), ювелірнай і вырабной справах (аквамарын, ізумруд, гранаты, нефрыт, раданіт і інш.), буд-ве (гліна, пясок, друз, бутавы камень). *В.І.Ярцаў.*

СІЛІКАТЫЗА́ЦЫЯ ГРУНТО́Ў, хімічны спосаб *замацавання грунтоў* шляхам нагнятання ў іх хім. рэагентаў: растворaў сілікату натрыю (вадкае шкло), хларыду кальцыю і інш. Выкарыстоўваюцца для надання грунтам трываласці і воданепранікальнасці.

СІЛІКАТЭРМІ́Я, гл. ў арт. *Металатэрмія*.

СІЛІКО́З (ад лац. silex крэмень), захворванне лёгкіх, якое развіваецца пры ўдыханні пылу з утрыманнем свабоднага двухвокісу крэмнію; найб. пашыраны і цяжкі від *пнеўмаканіёзу*. У рабочых гарнаруднай, машынабуд. прам-сці, тых, хто працуе на вытв-сці вогнетрывалых матэрыялаў, апрацоўцы граніту, *прафесійная хвароба*. Прыкметы С.: задышка, кашаль (сухі і вільготны), боль у грудзях. Лячэнне комплекснае.

СІЛІКО́НАВАЕ МА́СЛА, тое, што *крэмнійарганічныя вадкасці*.

СІЛІКО́НАВЫЯ КАЎЧУКІ́, тое, што *крэмнійарганічныя каўчукі*.

СІЛІКО́НЫ, тое, што поліарганасілаксаны; гл. *Крэмнійарганічныя палімеры*.

СІЛІ́СТРА, Сілістрыя, горад на ПнУ Балгарыі. Узнік як стараж.-рым. паселішча і крэпасць Дурасторум. Да канца 14 наз. Дарастол. Каля 80 тыс. ж. (2001). Вузел аўтадарог, чыг. ст., порт на р. Дунай. Прам-сць: маш.-буд., у т.л. вытв-сць электронна-выліч. тэхнікі і станкоў; харчасмакавая (мясная, мукамольная, кансервавая, вінаробчая), тэкст., дрэваапрацоўчая. Захаваліся рым. грабніца 4 ст. з насценнымі размалёўкамі, рэшткі руін рым. крэпасці. Рэзерват вадаплаўных птушак, у т.л. пеліканаў.

СІЛІЦЫ́ДЫ, злучэнні *крэмнію* з металамі. Паводле тыпу хім. сувязі адрозніваюць іонна-кавалентныя (С. шчолачных і шчолачназямельных металаў, а таксама С. магнію Mg_2Si) і металападобныя (С. пераходных металаў). Пашыраны С. саставаў (М — метал): MSi (напр., FeSi, TiSi); MSi_2 ($FeSi_2$, $NiSi_2$, $CrSi_2$); M_2Si (Ni_2Si, Co_2Si) і некат. інш.

Крышт. рэчывы з метал. бляскам, звычайна серабрыста-белага ці шэрага колеру. С. шчолачных і шчолачназямельных металаў раскладаюцца вадой, узаемадзейнічаюць з к-тамі і растворамі шчолачаў, пры награванні ў паветры загараюцца. С. пераходных металаў тугаплаўкія (напр., С. ванадыю V_5Si_3 мае $t_{пл}$ 2450 °С), не растваральныя ў к-тах, раскладаюцца растворамі шчолачаў, стойкія да акіслення, што абумоўлена ўтварэннем на іх паверхні плёнак *сілікатаў*. Асн. метад атрымання С. — спяканне ці сплаўленне крэмнію з металамі. Выкарыстоўваюць як кампанент керметаў і гарачаўстойлівых сплаваў, у хім. машынабудаванні для абліцоўкі рэактараў, мяшалак і інш. апаратуры, дысіліцыды хрому, марганцу, кобальту і некат. інш. як паўправадніковыя матэрыялы, што працуюць пры высокіх т-рах.

СІ́ЛІЧ Уладзіслаў Іванавіч (1906—43), бел. шахматыст, першы на Беларусі майстар спорту СССР па шахматах (1929—35, 1939). Жыў у Віцебску. Пераможца чэмпіянатаў Беларусі (1928, 1934, 1937). Вядомы даследаваннямі ў шахматных дэбютах (сіцыліянская, франц. абароны). Загінуў на фронце ў Вял. Айч. вайну.

СІЛО́, 1) у беларусаў самалоўнае прыстасаванне, дзеянне якога заснавана на зацягванні пятлі вакол лапы, шыі або тулава дзічыны. Выкарыстоўвалася з глыбокай старажытнасці для лоўлі баравых і балотных птушак, дробных і буйных звяроў. У залежнасці ад аб'екта, месца і часу палявання бытавалі ў некалькіх разнавіднасцях (кожнае мела сваё канкрэтнае прызначэнне і назву). Курапатак зімою, калі вял. маразы гналі іх да чалавечага жылля, лавілі на загуменні колам (ляшчынавы абруч, зацягнуты сеткай з тонкага моцнага шнура, да якой прывязвалі некалькі дзесяткаў петляў з конскага воласу). Пружкамі (невялічкае С. з петлямі на шнурку), прывязанымі пад гронкамі рабіны, сілілі рабчыкаў. Для лоўлі дупеляў ужывалі понажы — шматметровыя моцныя шнуры з мноствам валасяных петляў, прывязаных на адлегласці 15—20 см адна ад адной. Понажы падвешвалі на калках у 25—30 см ад зямлі і аблытвалі імі амаль усё такавішча. Шырока распаўсюджаны былі адзінарныя петлі з валасоў, шнуркоў і дроту. Імі лавілі птушак і звяроў. Устанаўлівалі петлі на звярыных пераходах, каля нор і на такавішчах двума спосабамі — «на зашморг» і «на падрыў». У першым выпадку звер сам зацягваў на сабе пятлю, якую прывязвалі да ўбітага ў зямлю калка або да галіны куста ці дрэва. Калі пятлю ставілі «на падрыў», яе прывязвалі да сагнутай і зашчэмленай вершаліны маладога дрэўца. Калі звер трапляў у пятлю, то выслабаняў вершаліну з-пад сучка, яна распрамлялася і падымала здабычу над зямлёю. На Палессі так лавілі вясною качараў, прывабліваючы іх манькутай (падсадной качкай на драўляным крузе) або чучалам. У наш час лоўля ўсімі відамі С. забаронена і аднесена да браканьерства.

2) Пятля, традыц. рыбалоўная прылада, якой лавілі пераважна невялікіх шчупакоў, што ў летнюю спякоту стаяць каля паверхні вады. Да канца тонкай палкі прымацоўвалі лёску (з конскага воласу), завязаную пятлёй, апускалі яе ў ваду, падводзілі пад шчэлепы шчупака і, зацягнуўшы яе рэзкім рухам, выкідвалі рыбіну на бераг ці ў лодку. Лавілі С. звычайна дзеці і падлеткі. Вядома па ўсёй Беларусі.

І.М.Браім, С.Ф.Цярохін.

СІЛУМІ́Н (ад лац. Silicium крэмній + Aluminium алюміній), група лёгкіх ліцейных сплаваў алюмінію (аснова) з крэмніем (3—13%, да 26%) і некаторымі інш. элементамі (медзь, марганец, магній, цынк, тытан, берылій). Выкарыстоўваецца ў аўта-, авія- і суднабуда-

ванні, а таксама для стварэння скульптуры.

СІЛУРЫ́ЙСКАЯ СІСТЭ́МА (ПЕРЫЯД), с і л у р (ад назвы стараж. племя сілураў, што некалі жыло ва Уэльсе, Вялікабрытанія), трэцяя сістэма *палеазойскай эратэмы* (*эры*), якая адпавядае трэцяму перыяду палеазойскай эры геал. гісторыі Зямлі. Падсцілаецца адкладамі *ардовікскай сістэмы* (*перыяду*), перакрываецца адкладамі *дэвонскай сістэмы* (*перыяду*). Пачалася 440 млн. г. назад, доўжылася 30 млн. г. Вылучана ў 1835 англ. геолагам Р.І.Мурчысанам. Падзяляецца на ніжні і верхні аддзелы. Ніжні ўключае ландаверыйскі і уэнлокскі ярусы, якія падзяляюцца на 5 пад'ярусаў; верхні — лудлаўскі (2 пад'ярусы) і пржыдольскі. Для сілуру існуе адзіная шкала грапталітавых зон, складзеная паводле класічных разрэзаў у Вялікабрытаніі і Чэхіі.

Адклады гэтай сістэмы прадстаўлены мелкаводнымі шэльфавымі, пераважна карбанатнымі тоўшчамі з бентаснай фаунай і арганагеннымі пабудовамі (пашыраны на Усх.-Еўрапейскай і Сібірскай платформах, у Цэнтр. і Паўд. Кітаі, на паўн.-амер. Мідкантыненце, у Паўн. Афрыцы) і глыбакаводнымі тэрыгеннымі асадкамі з планктоннай фаунай. Найб. кантынентам у сілуры была *Гандвана*, больш дробныя масівы сушы — Лаўрэнція, Балта-Сарматыя, Ангарыда і інш. Сілурыйскаму перыяду папярэднічалі глабальнае покрыўнае зледзяненне, максімум рэгрэсіі і перарывы ў платформавым асадканамнажэнні. Пачатак сілуру адзначаны магутнай ландаверыйскай трансгрэсіяй, якая максімальна праявілася на Гандване, Паўн.-Амерыканскай і Сібірскай платформах. У канцы ранняга уэнлоку адзначаецца рэгрэсія, якая працягвалася да сярэдзіны ранняга дэвону. Геасінклінальныя зоны характарызуюцца дыферэнцыраванымі тэктанічнымі рухамі, праяўленнем падводнага вулканізму і стракатасцю асадкаў. У канцы сілурыйскага перыяду закончылася *каледонская складкавасць*. Нешматлікія літалагічныя індыкатары палеаклімату сведчаць пра гумідныя ўмовы ў ландаверыйскім веку, паступовым пацяпленні і арыдызацыі клімату ў уэнлоку і познім сілуры. У арганічным свеце да пач. сілуру сфарміраваны асн. класы беспазваночных арганізмаў і з'явіліся пазваночныя. Для мелкаводных зон характэрна ракушачна-каралавая фауна, у т.л. гідроідныя паліпы (табуляты, ругозы, строматапараты). Донная фауна прадстаўлена брахіяподамі і малюскамі (гастраподы, двухстворкавыя, тантакуліты), у лагунах і на адкрытым шэльфе — астракодамі, трылабітамі і ракаскарпіёнамі; вядомы бяссківічныя. У канцы сілуру з'явіліся рыбы — акантоды. Пелагіяль насялялі грапталіты, наўцілаідэі і канадонты. З расл. арганізмаў характэрны водарасці, з наземных — рэшткі псілафітаў. З карысных выкапняў да адкладаў сілуру прымеркаваны запасы нафты, буйныя радовішчы жал. руд, меднага калчадану, марганцу, фасфарытаў, гіпсу, каменнай солі і інш.

На Беларусі сілурыйскія адклады магутнасцю да 630 м пашыраны на ПдЗ (Брэсцкая ўпадзіна) і да 76 м на ПнЗ (схіл Бел. антэклізы). Яны складзены з вапнякова-мергельных парод са шматлікай выкапнёвай фаунай (грапталіты, брахіяподы, гастраподы, імшанкі, каралы і інш.) і акрытархамі. У гэты перыяд пераважала суша. Марскі басейн, што наступаў з З у выглядзе 2 заліваў — Балтыйскага і Падляска-Брэсцкага, найб. плошчу заняў у канцы ландаверыйскага веку.



Да арт. **Сіло**. Сілкі: 1 — пружкі; 2 — понажы; 3 — пятля; 4 — трыгубіца.

СІЛУЭ́Т [франц. silhouette ад імя франц. міністра 18 ст. Э. дэ Сілуэта (E. de Silhouette), на якога была зроблена карыкатура ў выглядзе ценявога профілю], 1) характэрны абрыс прадметаў, бачны як адзіная плоская пляма без дэталей унутры контуру. Выразнасць С. звязана з характарам контуру і залежыць ад формы, месцазнаходжання і асветленасці аб'екта. 2) Від маст. тэхнікі: плоскасная аднатонная выява фігур і прадметаў, якая ўтварае суцэльную, абмежаваную контурам пляму на кантрастным фоне. Мастацтва С. вядома са старажытнасці ў Кітаі, Японіі (асабліва ў *тэатры ценяў*) і інш. краінах Азіі; у Еўропе пашырана з 18 ст. У тэхніцы С. (пераважна ў графіцы) выконваюць профільныя партрэты, быт. сцэнкі, ілюстрацыі, нацюрморты. Вял. ролю адыгрывае С. у плакаце. Сярод майстроў С. — Ф.Антынг, Ф.О.Рунге (Германія), А.Бенуа, М.Дабужынскі, У.Маякоўскі, К.Сомаў, Ф.Талстой (Расія), М.Селяшчук (Беларусь) і інш. Своеасаблівая разнавіднасць С. — *выцінанка*. 3) Контурная выява фігуры (пераважна ў натуральны памер), прызначаная для стварэння ілюзіі прысутнасці жывога чалавека. Выразаныя з дошкі і размаляваныя С. ўзніклі ў 1-й пал. 17 ст. ў Галандыі, пазней пашырыліся ў інш. краінах Зах. Еўропы. Выкарыстоўваліся як экран для камінаў, для імітацыі варты, падтрымкі расчыненых дзвярэй і інш. З 19 ст. выкарыстоўваецца як рэкламны сродак (фігуры ля ўваходаў у рэстараны, у вітрынах магазінаў і інш.), у наш час вырабляецца пераважна як наклееная на кардон фотавыява. *С.У.Пешын.*

СІ́ЛЫ ХУ́ТКАГА РАЗГО́РТВАННЯ, с і л ы х у т к а г а р э а г а в а н н я, спец. падрыхтаваныя фарміраванні ў шэрагу нац. і аб'яднаных узбр. сіл, прызначаныя для экстранага выкарыстання ў стратэг. важных рэгіёнах пры ўзнікненні там крызісных сітуацый. У ЗША створаны ў канцы 1970-х г., у Вялікабрытаніі, Францыі і Італіі — у пач. 1980-х г., у аб'яднаных узбр. сілах НАТО і арміях шэрагу інш. краін — у 1990-я г. Аснову аб'яднаных С.х.р. НАТО складае «Еўракорпус», у які ўваходзяць некалькі дывізій рознай нац. прыналежнасці, а таксама інш. спец. фарміраванні. У некат. дзяржавах СНД, у т.л. Расіі, Беларусі, ролю С.х.р. выконваюць *паветрана-дэсантныя войскі* (гл. раздз. Узброеныя сілы ў арт. *Расія*), *мабільныя сілы* і інш. спец. ўзбр. фарміраванні. Для С.х.р. характэрны высокая боегатоўнасць, стратэг. і аператыўная мабільнасць, падрыхтаванасць для вядзення баявых дзеянняў у складаных фізіка-ге-

агр. умовах. С.х.р. ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Расіі і інш. неаднаразова выкарыстоўваліся ў правядзенні ваен. і міратворчых аперацый.

СІЛЬ, тое, што *сель*.

СІЛЬВІ́Н (ад Sylvius — лацініз. імя галанд. ўрача і хіміка Ф.Боэ), мінерал класа хларыдаў, хларыд калію, KCl. Мае калію да 52,5%, хлору да 47,5%, прымесі натрыю і аміяку. Крышталізуецца ў кубічнай сінганіі. Утварае шчыльныя зярністыя масы, шаставатыя і валакністыя агрэгаты, радзей кубічныя і кубаактаэдрычныя крышталі і інш. Бясколерны або малочна-белы, з прымесямі гематыту — жоўта-чырвона-ружаватых адценняў. Часта празрысты. Бляск шкляны. Цв. 2. Шчыльн. 2 г/см^3. Крохкі. Характэрны горка-салёны смак, лёгкая растваральнасць у вадзе, моцная гіраскапічнасць. Разам з *галітам*, *карналітам* і інш. ўтварае *сільвініт*. Гал. радовішчы хемагенна-асадачнага генезісу. Пашыраны ў выкапнёвых марскіх саляносных фармацыях і кантынент. эвапарытавых. Трапляецца ў вулканічных узгонах, сучасных азёрах, экзагенных выцвітах. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці калійных угнаенняў і хім. прам-сці. З празрыстых крышталяў вырабляюць прызмы для інфрачырвонай спектраскапіі. Прамысл. радовішчы на Беларусі, Украіне, у Расіі, Германіі, ЗША і інш.

Э.А.Высоцкі.

Сільвін.

СІЛЬВІНІ́Т, саляная асадкавая горная парода, якая ўяўляе сабой шчыльную агрэгатную сумесь крышталяў *сільвіну* (15—60%) і *галіту* (25—85%), а таксама растваральных *карналіту* (5—10% і болей), лангбейніту, кізерыту і інш. і нерастваральных — гліны, карбанатаў, ангідрыту і інш. прымесей. Афарбоўка чырвоная і стракатая. Чырванаколерныя С. маюць мікра-, дробна- і сярэднезярністую структуру, слаістую тэкстуру; стракатаколерныя С. — сярэдне- і буйназярністую структуру, плямістую і масіўную тэкстуру і характэрныя для іх сінія крышталі галіту. Утвараецца пераважна хемагенным шляхам у выніку выпадзення хларыду калію (KCl) і хларыду натрыю (NaCl) у асадак у басейнах павышанай салёнасці (прыбярэжнамарскога і лагуннага тыпу) ва ўмовах арыднага клімату пры выпарэнні або ахаладжэнні *рапы*. Радовішчы ў Канадзе, Расіі, Германіі, Казахстане, ЗША, на Украіне і інш. На Беларусі паклады С. ў *Прыпяцкім саляносным басейне*. Распрацоўваецца *Старобінскае радовішча калійных і каменнай солей*, разведана *Петрыкаўскае радовішча калійных солей*.

Э.А.Высоцкі.

М.Ф.Сільніцкі.

СІЛЬВЯСТРО́ВІЧ Станіслаў (31.1.1833, Гродзенская губ.? — 1910), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—64 у Польшчы, Беларусі і Літве. Скончыў Дэрпцкі ун-т (1855). Быў блізкі да рэв. арг-цыі К.Каліноўскага і В.Урублеўскага. З 2-й пал. 1862 як акруговы начальнік кіраваў падрыхтоўкай паўстання ў паўн. частцы Гродзенскага пав. З вясны 1863 паўстанцкі цывільны начальнік Гродзенскага пав., з чэрв. — начальнік ваяводства. 30.7.1863 арыштаваны, 8 месяцаў яго трымалі ў гродзенскай, з крас. 1864 дамініканскай турме ў Вільні. Пры допытах Асобай следчай камісіяй даў падрабязныя паказанні, якія сёння з'яўляюцца важнай крыніцай па гісторыі паўстання на Гродзеншчыне. Асуджаны на 8 гадоў катаргі ў Сібіры.

Літ.: Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861—1862 гг. М., 1964.

Г.В.Кісялёў.

СІЛЬНІ́ЦКІ Міхаіл Фёдаравіч (20.11.1921, в. Заполле, Віцебскага р-на — 28.3.1942), Герой Сав. Саюза (1942). У Вял. Айч. вайну з 1941 кулямётчык партыз. атрада Д.Ф.Райцава (дзейнічаў на тэр. Суражскага р-на Віцебскай вобл.). Вызначыўся ў *Курынскім баі 1942* 28 сак.: прыкрываючы адыход атрада, агнём з кулямёта знішчыў дзесяткі гітлераўцаў, але акружаны ворагам, загінуў у рукапашным баі. У в. Лужасна яму пастаўлены помнік, у в. Блізніца — бюст.

СІЛЬНОВА Людка (Людміла Данілаўна; н. 20.4.1957, г. Маладзечна Мінскай вобл.), бел. паэтэса. Скончыла БДУ (1979). З 1973 працавала на Маладзечанскай фабрыцы маст. вырабаў, БДУ, ва ўстановах асветы Уздзенскага р-на і г. Мінска, з 1986 у Нац. б-цы Беларусі. Друкуецца з 1985. У паэт. зб-ках «Ластаўка ляціць...» (1993) і «Зеленавокія воі і іх прыгажуні» (2001) роздум над лёсам жанчыны, тэмы паэта і паэзіі. Аўтар кніг «Рысасловы» (1994), «Агністыя дзьмухаўцы» (1997).

А.В.Спрынчан.

СІЛЬФО́Н (ад англ. фірменнай назвы Sylphon), металічная танкасценная цыліндрычная трубка або камера з хвалепадобнымі гофрамі. Высокаадчувальны да змены ціску. Бываюць суцэльныя і зварныя.

Асн. характарыстыка — залежнасць паміж модулем сілы расцяжэння або сціскання, якое дзейнічае на С., і модулем дэфармацыі (прагіну). Выкарыстоўваюцца ў кантрольна-вымяральных прыладах (напр., у дыферэнцыяльных манометрах, монаметрычных рэле), таксама як пругкія раздзяляльнікі асяроддзяў, гнуткія ўшчыльняльныя прыстасаванні, кампенсатары тэмпературных дэфармацый.

СІ́ЛЬЧАНКА Мікалай Уладзіміравіч (н. 4.3.1954, пас. Чырвоны Свет Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. праваед. Д-р юрыд. н. (1994), праф. (1995). Скончыў Калінінградскі ун-т (1975). З 1982 у Гродзенскім ун-це. Навук. працы па праблемах тэорыі і гісторыі бел. дзяржаўнасці, мясц. самакіравання, законатворчасці і развіцця прававых сістэм. Распрацаваў тэорыю вяршэнства закону ва ўмовах падзелу ўлад.

Тв.: Закон: Пробл. этимологии, социологии и логики. Мн., 1993; Беларуская дзяржаўнасць. Гродна, 1997 (разам з І.А.Басюком); Проблемы законотворчества и развития правовых систем. Гродно, 1997 (у сааўт.); Гісторыя мясцовага самакіравання на Беларусі. Гродна, 2000 (разам з Н.В.Місарэвіч).

І.А.Басюк.

СІЛЯ́ЕВА Ніна Фёдараўна (н. 26.12.1938, Мінск), бел. вучоны ў галіне паталаг. анатоміі. Д-р мед. н. (1990), праф. (1993). Скончыла Мінскі мед. ін-т (1961). З 1966 у Гродзенскім мед. ун-це. Навук. працы па патамарфалогіі энцэфалітаў, энцэфалапатый плода і нованароджаных, патамарфалогіі органаў зроку, клініка-анат. аналізе ўрачэбных памылак.

Тв.: Врожденные пороки и аномалии развития глаз // Тератология человека: Руководство для врачей. 2 изд. М., 1991; Патоморфология органа зрения в перинатальном периоде. Мн., 1993 (разам з Ю.Р.Бойка); Клинико-анатомический анализ врачебных ошибок. Мн., 1994 (з ім жа).

СІМАБА́РСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ, паўстанне ў Японіі ў 1637—38 на п-ве Сімабара (каля г. Нагасакі). Яго ўдзельнікамі былі сяляне, якіх еўрап. місіянеры схілілі да хрысціянства, таму С.п. набыло характар рэліг. руху. На задушэнне С.п. сёгунскі ўрад накіраваў 100-тыс. войска. Паўстанцы (каля 38 тыс. чал.) умацаваліся ў замку Хара, які быў захоплены пасля некалькіх месяцаў аблогі, амаль усе яго абаронцы забіты. С.п. стала падставай для поўнай забароны хрысціянства ў Японіі і ў далейшым — самаізаляцыі краіны.

СІМАКО́ЎСКАЕ КАМСАМО́ЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў в. Сімакі Багушэўскага р-на Віцебскай вобл. ў ліп. 1941 — вер. 1943 (кіраўнікі А.А.Нахаеў, А.Н.Ляхоўская). Падпольшчыкі (20 чал.) збіралі зброю і боепрыпасы, трымалі сувязь і супрацоўнічалі з дэсантнай групай Чырв. Арміі (кіраўнік М.А.Кавалёў),

распаўсюджвалі сярод насельніцтва зводкі Саўінфармбюро. З чэрв. 1943 падполле дзейнічала ў кантакце з кіраўніцтвам партыз. брыгады А.Ф.Данукалава і Віцебскага патрыят. падполля. З-за пагрозы арышту падпольшчыкі пайшлі ў партызаны.

СІМАНАЙЦІ́ТЭ (Simonaitytė) Ева (23.1.1897, в. Ванагай Клайпедскага пав., Літва — 27.8.1978), літоўская пісьменніца. Нар. пісьменнік Літвы (1967). Друкавалася з 1914. Раманы «Лёс Шымонісаў» (1935, Дзярж. прэмія Літвы 1936), «Апошняе падарожжа Куняліса» (1971) пра трагічныя лёсы літоўцаў Клайпедскага краю, працэс анямечвання ў 18—19 ст., праблемы нац. самавызначэння. У аповесці «Пікчурнене» (1953), рамане «Вілюс Каралюс» (ч. 1—2, 1939—56, Дзярж. прэмія Літвы 1958) адлюстраваны грамадска-паліт. падзеі пач. 20 ст. Аўтар аўтабіягр. трылогіі «...А было так» (1960), «У чужым доме» (1962), «Незавершаная кніга» (1965), кн. мемуараў «Блізкія гісторыі» (1968) і інш. Яе творам уласціва спалучэнне рэалізму з элементамі рамант. сімволікі, лірызму.

Тв.: Рус. пер. — Буше и ее сестры. М., 1955; Вилюс Каралюс. Кн. 1—2. Вильнюс, 1961; Судьба Шимонисов. Вильнюс, 1985; ... А было так; В чужом доме; Неоконченная книга. М., 1973; Последнее путешествие Куняли-са. М., 1974. *А.П.Лапінскене.*

СІМАНАСЭ́КІ, К а м о н, праліў паміж а-вамі Хонсю і Кюсю (Японія). Злучае Унутр. Японскае м. (Сета-Найкай) з Карэйскім прал. Даўж. 21 км, найменшая шыр. 600 м, найменшая глыб. на фарватэры 11 м. Праз С. пабудаваны аўтамабільны мост (1068 м), пад С. — 2 тунэлі з чыгункамі. Парты: Сімана-секі, Кітакюсю, Модзі, Вакамацу, Какура.

СІМАНАСЭ́КІ, горад у Японіі, на ПдЗ в-ва Хонсю, каля праліва Сімана-секі. Каля 350 тыс. ж. (2001). Разам з г. Кітакюсю (в-аў Кюсю) утварае адзіны порт Камон. Берагі праліва злучаны 2 чыг. тунэлямі, аўтамаб. паромам і мостам. Прам-сць: трансп. машынабудаванне, у т.л. верфі; нафтаперапр., хім., цэм., рыбакансервавая. Цэнтр рыбалоўства.

СІМАНАСЭ́КСКІ ДАГАВО́Р 1895. Заключаны паміж Японіяй і Кітаем 17 крас. ў г. *Сімана-секі* (Японія) у выніку паражэння Кітая ў *япона-кітайскай вайне 1894—95*. Паводле яго Кітай адмовіўся ад свайго сюзерэнітэту над Карэяй, перадаў Японіі а-вы Тайвань і Пэнхуледао, Ляадунскі п-аў, выплаціў Японіі кантрыбуцыю, адкрыў для яп. гандлю шэраг кіт. партоў, абавязаўся заключыць з Японіяй гандлёвы дагавор (падпісаны ў 1896, даў Японіі тыя ж прывілеі, што і еўрап. краінам). 23.4.1895 Расія, Германія і Францыя запатрабавалі ад Японіі адмовіцца ад анексіі Ляадунскага п-ва. Японія прыняла гэта патрабаванне ў абмен на павышэнне Кітаем кантрыбуцыі.

СІ́МАНАЎ Канстанцін (Кірыла) Міхайлавіч (28.11.1915, С.-Пецярбург — 28.8.1979), рускі пісьменнік. Герой Сац. Працы (1974). Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1938). У Вял. Айч. вайну ваен. карэспандэнт газ. «Красная звезда», удзельнік абароны Магілёва. У 1938, 1950—53 гал. рэдактар «Литературной газеты», у 1946—50, 1954—58 — час. «Новый мир». У 1946—54 нам. ген. сакратара, у 1954—59 і 1967 сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР. Друкаваўся з 1934. Асэнсаванне

К.М.Сіманаў.

М.К.Сіманаў.

тэмы патрыятызму ў зб. вершаў «Сапраўдныя людзі» (1938), гіст. паэмах «Пераможца» (1937), «Лядовае пабоішча» (1938), «Суворaў» (1939), п'есе «Хлопец з нашага горада» (1941, Дзярж. прэмія СССР 1942). Пра гераізм народа ў барацьбе з фашызмам у зб-ках «Лірычны дзённік», «З табою і без цябе», «Франтавыя вершы» (усе 1942), п'есах «Рускія людзі» (1942, Дзярж. прэмія СССР 1943) і «Так і будзе» (1944), аповесці «Дні і ночы» (1943—44, Дзярж. прэмія СССР 1946). Нарысы і артыкулы С. блізкія да маст. апавяданняў. Падзеям вайны прысвечаны раман «Таварышы па зброі» (1952), трылогія «Жывыя і мёртвыя», «Салдатамі не нараджаюцца» і «Апошняе лета» (1959—71, Ленінская прэмія 1974), аповесць «З запісак Лапаціна» (1965). З твораў пра лёс асобных герояў створана шырокая панарама вайны, летапіс гісторыі народа ў змаганні з фашызмам. Праблемы барацьбы за мір, за прадухіленне новай вайны ў п'есах «Рускае пытанне» (1946, Дзярж. прэмія СССР 1947), «Пад каштанамі Прагі» (нап. 1946), «Чужы цень» (1949, Дзярж. прэмія СССР 1950), кнізе вершаў «Сябры і ворагі» (1948, Дзярж. прэмія СССР 1949). Выступаў як публіцыст, літ. крытык, перакладчык. Успаміны «Вачыма чалавека майго пакалення: Роздумы пра І.В.Сталіна» (апубл. 1988) — лірыка-філас. аповед пра жыццё чалавека і лёс краіны. Па сцэнарыях С. пастаўлены фільмы: «Хлопец з нашага горада» (1942), «Чакай мяне» (1943), «Дні і ночы» (1943—44), «Бессмяротны гарнізон» (1956), «Нарманды — Нёман» (1960, з Ш.Спаакам і Э.Трыяле), «Жывыя і мёртвыя» (сер. 1—2, 1964) і інш. У лірыцы, раманах, нарысах, дзённікавых запісах «Розныя дні вайны» (1975) С. шырока адлюстравана Беларусь. Першыя два рэпартажы з фронту зрабіў каля Барысава і Оршы (чэрв. 1941), трэці — «Гарачы дзень» — пад Магілёвам (прысвечаны яго абаронцам), дзе на *Буйніцкім полі* знішчылі 39 ням. танкаў. Абаронцы Магілёва і інш. населеных пунктаў Беларусі — прататыпы многіх вобразаў твораў С., у т.л. верша «Ты памятаеш, Алёша, дарогі Смаленшчыны...». У пасляваен. гады С. часта прыязджаў на Беларусь — у Магілёў (неаднаразова), Брэст, Чавусы, Крычаў і інш. гарады. На рус. мову пераклаў паэму В.Таўлая «Таварыш». На бел. мову вершы С. перакладалі М.Аўрамчык, С.Дзяргай, М.Калачынскі, У.Паўлаў, М.Ракітны, Я.Семяжон, К.Цвірка, У.Шахавец, аповесць «Дні і ночы» — А.Кудравец. На сцэнах бел. т-раў ставіліся яго п'есы «Хлопец з нашага горада», «Рускія людзі», «Чацьвёрты» і інш. На Буйніцкім полі ўстаноўлены мемарыяльны знак С.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—12. М., 1979—87; Бел. пер. — Дні і ночы. Мн., 1979.

Літ.: В и ш н е в с к а я И.Л. Константин Симонов: Очерк творчества. М., 1966; Л а з а р е в Л. Военная проза Константина Симонова. М., 1975; Константин Симонов в воспоминаниях современников. М., 1984. *К.Р.Хромчанка.*

СІ́МАНАЎ Мікалай Канстанцінавіч (4.12.1901, г. Самара, Расія — 20.4.1973), расійскі акцёр. Нар. арт. СССР (1950). Герой Сац. Працы (1971). Вучыўся ў Петраградскай АМ (1919—22). З 1924 (з перапынкам) акцёр Ленінградскага т-ра драмы імя А.Пушкіна. Мастацтва С. адметнае высокай, гераіка-рамантычнай адухоўленасцю: Механошаў («Канец Крыварыльска» Б.Рамашова), Вяршынін («Браняпоезд 14-69» У.Іванава), Хлебнікаў («Персанальная справа» А.Штэйна). Сярод роляў класічнага рэпертуару: Пратасаў («Жывы труп» Л.Талстога), Сальеры («Моцарт і Сальеры» Пушкіна), Матыяс Клаўзен («Перад захадам сонца» Г.Гаўптмана) і інш. З 1924 здымаўся ў кіно: «Чапаеў» (1934), «Пётр I» (1937—39), «Сталінградская бітва» (1949), «Авадзень» (1955) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1941, 1947, 1950. Дзярж. прэміі Расіі 1973.

Літ.: Ц и м б а л С. Николай Симонов. М., 1973.

СІ́МАНАЎ Рубен Мікалаевіч (1.4.1899, Масква —5.12.1968), расійскі акцёр, рэжысёр, педагог. Нар. арт. СССР (1946). Вучыўся ў Маск. ун-це (1918). З 1919 у драм. студыях. Вучань Я.Вахтангава. Акцёр, з 1924 рэжысёр, з 1939 гал. рэжысёр Т-ра імя Вахтангава. Выкладаў у Тэатр. вучылішчы імя Шчукіна (з 1946 праф.). Сярод роляў: Віцэ-кароль («Карэта святых дароў» П.Мерыме), Бенядзікт («Многа шуму з нічога» У.Шэкспіра), Даменік Сарыяна («Філумена Мартурана» Э.Дэ Філіпа), Сірано («Сірано дэ Бержэрак» Э.Растана) і інш. Паставіў «Інтэрвенцыю» Л.Славіна (1933), «Фронт» А.Карнейчука (1942), «Фама Гардзееў» паводле М.Горкага (1956), «Канармію» І.Бабеля (1966) і інш. Здымаўся ў кіно. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1947, 1950. Ленінская прэмія 1967.

СІМАНАЎ Сяргей Гаўрылавіч (4.10.1894, в. Фядотава Уладзімірскай вобл., Расія — 1986), савецкі канструктар стралк. зброі. Герой Сац. Працы (1954). Засл. вынаходнік РСФСР (1964). З 1929 на кулямётным з-дзе (нач. цэха, канструктар, кіраўнік эксперым. майстэрні). Сканструяваў ручны кулямёт і 15-зарадную аўтам. вінтоўку, якая была прынята на ўзбраенне ў 1936. Стварыў 14,5-міліметровае процітанкавае самазарадное ружжо (1941), самазарадны карабін (1945). Дзярж. прэміі СССР 1942, 1949.

СІМАНАЎ Юрый Іванавіч (н. 4.3.1941, г. Саратаў, Расія), расійскі дырыжор, педагог. Нар. арт. СССР (1981). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1965, 1968). З 1969 дырыжор, з 1970 гал. дырыжор Вял. т-ра ў Маскве. У 1985—89 маст. кіраўнік і гал. дырыжор арганізаванага ім Дзярж. Малога сімф. аркестра СССР. Адначасова ў 1978—91 выкладаў у Маскоўскай кансерваторыі (з 1985 праф.). З 1994 муз. дырэктар Бельгійскага нац. аркестра, пастаянны запрошаны дырыжор аркестра Венгрыі. З 1998 узначальвае Акад. сімф. аркестр Маскоўскай філармоніі. Сярод пастановак у Вял. т-ры: оперы «Руслан і Людміла» М.Глінкі, «Пскавіцянка» М.Рымскага-Корсакава, «Золата Рэйна» Р.Вагнера, «Так робяць усе» В.А.Моцарта, «Замак герцага Сіняя Барада» Б.Бартока, балеты «Пятрушка» і «Жар-птушка» І.Стравінскага, «Ганна Карэніна» Р.Шчадрына, «Залаты век» Дз.Шастаковіча. Ставіў оперы ў т-ры «Ковент-Гардэн» і інш. 1-я прэмія Міжнар. конкурса аркестравых дырыжораў (1968, Рым). *Л.А.Шымановіч.*

СІМАНЁНКА Васіль Андрэевіч (8.1.1935, с. Біеўцы Палтаўскай вобл., Украіна — 14.12.1963), украінскі паэт. Скончыў Кіеўскі ун-т (1957). Друкаваўся з 1962. Аўтар зб-каў вершаў «Цішыня і гром» (1962), «Зямное прыцяжэнне» (апубл. 1964), «Вершы» (апубл. 1966), «Лебедзі мацярынства» (апубл. 1981), зб. апавяд. «Віно з руж» (апубл. 1965). Пісаў нарысы, публіцыст. артыкулы, вершы для дзяцей. Паэзія С. адметная лірызмам, гуманіст. пафасам. На бел. мову асобныя вершы С. пераклалі Д.Бічэль-Загнетава, С.Законнікаў, М.Мінчанка, В.Рагойша, М.Федзюковіч, У.Шахавец.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Ад круч дняпроўскіх. Мн., 1983.

СІМАНІЧЫ, вёска ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл., на р. Свінавод. Цэнтр сельсавета і камунальнага с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 22 км на ПнЗ ад г.п. Лельчыцы, 229 км ад Гомеля, 75 км ад чыг. ст. Ельск. 907 ж., 338 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аддз. сувязі. Богаяўленская царква. Брацкая магіла сав. воінаў.

СІМАНО́ВІЧ Давід Рыгоравіч (н. 26.6.1932, г. Нароўля Гомельскай вобл.), бел. паэт. Скончыў БДУ (1955). Працаваў настаўнікам, у газ. «Віцебскі рабочы», у 1961—94 на Віцебскім абл. тэлебачанні. Друкуецца з 1948. Піша на рус мове. Першая кніга паэзіі — «Вясновая казка» (1959). У паэт. зб-ках «Чэрвень-рака» (1962), «Раўнадзенства» (1966), «Мінуты» (1969), «Станцыя трывогі і любові» (1972), «Пісьмо табе» (1975), «Сустрэчныя цягнікі» (1978), «Сілуэты дзён» (1981), «Верасні» (1990) памяць мінулай вайны, роздум пра сённяшні дзень, філас. асэнсаванне мінулага і сучаснага. Кнігі нарысаў і эсэ «Падарожная Аляксандра Пушкіна» (1977), «Праз даль часоў» (1984) пра вядомых людзей, чые жыццёвыя і творчыя шляхі праходзілі праз Беларусь. Піша для дзяцей (зб-кі вершаў «Чароўны луг», 1959; «Зялёны конік», 1968). Аўтар тэлеп'ес «Якаў Свярдлоў» (паст. 1963), «Восеньскі букет. І.Рэпін у Здраўнёве» (паст. 1964), сцэнарыяў тэлефільмаў. Перакладае на рус. мову творы бел. паэтаў. Асобныя яго вершы пакладзены на музыку.

Тв.: Избранное. Мн., 1995; Солнечный хмель. Мн., 1982; Имею честь принадлежать. Витебск, 1999; Душа за облако цеплялась...: Лирика любви. Витебск, 2001; Мой Шагал, или Полет любви: Стихи, переводы. Витебск, 2001.

СІМАНО́ЎСКІ Іосіф Бенцыянавіч (24.4.1892, г. Бабруйск Магілёўскай вобл. — 8.10.1967), бел. бібліятэказнавец, бібліёграф, перакладчык. Засл. дз. культ. Беларусі (1957). Скончыў Бернскі ун-т (1914; Швейцарыя). У 1918—21 заг. Бабруйскай гар. б-кі. У 1922—37, 1944—61 дырэктар Дзярж. б-кі БССР імя Леніна, у 1937—41 — Навук. мед. б-кі Беларусі. Выкладаў у Маскоўскім бібліятэчным (1942—44) і Мінскім пед. (1944—57) ін-тах. Аўтар прац па тэорыі і методыцы бібліятэказнаўства. На бел. мову перакладаў творы Г.Гейнэ, А.Міцкевіча, на рус. — Э.Верхарна.

Тв.: Белорусская советская библиография. Ч. 1. Мн., 1965.

СІМАХІЯ (грэч. symmachia ад syn разам + machomai ваюю), у Старажытнай Грэцыі ваенны саюз, які заключаўся паміж *полісамі*. Першыя С. ўзніклі ў 6 ст. да н.э. Полісы-саюзнікі абавязваліся разам весці ваен. дзеянні, мелі агульную казну, шэраг органаў кіравання (напр., сінод — агульнасаюзны сход, сінедрыён — савет прадстаўнікоў полісаў-саюзнікаў), выратавалі разам агульныя справы. Фармальна ўсе члены С. захоўвалі поўную аўтаномію, але фактычна больш слабыя ўдзельнікі дагавора павінны былі адмаўляцца ад самастойнай знешняй палітыкі і трапляліў залежнасць ад поліса, які ўзначальваў С. Найб. вядомыя С.: на чале са Спартай (*Пелапанескі саюз*), Афінамі (*Дэлоскі саюз*), Фівамі (Беатыйскі саюз), Мегалопалем (Аркадскі саюз), *Ахейскі саюз*, *Эталійскі саюз* і Карынфскі саюз.

СІМБІЁЗ (ад грэч. symbiōsis сумеснае жыццё), сумеснае існаванне арганізмаў (сімбіёнтаў) розных сістэматычных груп. Тэрмін увёў ням. батанік Г.А. дэ *Бары* (1879). Бывае аблігатны С., калі 1 з арганізмаў (ці 2) знаходзяцца ў цеснай залежнасці ад другога і самастойнае існаванне немагчыма, і факультатыўны С. — калі кожны з арганізмаў пры адсутнасці партнёра можа жыць самастойна. Па характары адносін паміж партнёрамі выдзяляюць тыпы (формы) С.: *каменсалізм*, *мутуалізм*, *паразітызм*. Паміж імі магчымы пераходы, шэраг градацый і пераходных станаў.

Асновай для ўзнікнення С. могуць быць трафічныя (кармленне аднаго з партнёраў за кошт другога нявыкарыстанымі рэшткамі корму, прадуктамі стрававання або яго тканкамі), прасторавыя (пасяленне на паверхні або ўнутры цела другога, сумеснае выкарыстанне нораў, домікаў, ракавін) і інш. тыпы ўзаемаадносін. С. можа быць на ўзроўні шматклетачных арганізмаў і асобных клетак (унутрыклетачны С.). У адносінах С. могуць уступаць расліны з раслінамі, расліны з жывёламі, жывёлы з жывёламі, расліны і жывёлы з мікраарганізмамі, мікраарганізмы з мікраарганізмамі.

СІМБІ́РЦАЎ Васіль Мікалаевіч (14.1.1901, С.-Пецярбург — 1982), расійскі архітэктар. Нар. архітэктар СССР (1975). Скончыў Маскоўскі вышэйшы маст.-тэхн. ін-т (1928). Выкладаў у Валгаградскім ін-це інжынераў гар. гаспадаркі (1955—59). Удзельнік пасляваен. аднаўлення і буд-ва Валгаграда (гал. архітэктар у 1944—59), праектавання яго асобных раёнаў і збудаванняў (Алея герояў, пл. Паўшых змагароў і інш., усе ў сааўт.). Адзін з аўтараў праектаў будынка Т-ра Сав. Арміі ў Маскве (пабудаваны ў 1934—40), забудовы жылога раёна Другая Рэчка ва Уладзівастоку (1960-я г.). Дзярж. прэмія СССР 1951.

СІ́МВАЛ (ад грэч. symbolon знак, апазнавальная прыкмета), універсальны вобраз, *знак*, які ўвасабляе пэўную ідэю. Ствараецца чалавекам у працэсе пазнання рэчаіснасці і развіцця культуры. Форма С. не мае непасрэднай сувязі з адлюстраваным ім зместам. У адрозненне ад інш. відаў знакаў С. мае пачуццёва-наглядную форму, а сувязь паміж формай і закладзеным у ёй сэнсам не з'яўляецца адвольнай. У маст. культуры С. з'яўляецца адным з гал. сродкаў выяўлення духоўных і эстэт. каштоўнасцей, аўтарскай мадэлі свету. На пэўных этапах развіцця мастацтва С. прэваліравалі ў маст. мове (напр., сярэдневяковае мастацтва, *сімвалізм*). У адрозненне ад *алегорыі* С. не мае рацыянальнай формулы, разлічанай на адназначную трактоўку. Сэнсавая структура С. шматзначная і прадугледжвае актыўнае ўспрыняцце суб'ектам. Праблема С. разглядалася ўжо ў ант. філасофіі (Платон). У сярэдневяковай філасофіі навакольнае асяроддзе тлумачылася як С. сутнасці Бога (Псеўда-Дыянісій Арэапагіт). Эстэт. асэнсаванне С. прапанавана тэарэтыкамі ням. рамантызму, якія проціпастаўлялі С. алегорыі (Ф.Шэлінг, Ф.Крэйцэр) і бачылі ў ім аснову паэт. творчасці (Ф.Шлегель). Рацыяналістычную трактоўку

С. прапанаваў Г.Гегель, які разглядаў С. пераважна ў якасці знака. Прыхільнікі псіхааналізу трактуюць С. як форму выяўлення псіхапаталагічнага сімптому асобы (З.Фрэйд) ці ўстойлівых форм калектыўнага бессвядомага — *архетыпаў* (К.Г.Юнг). Ням. філосаф Э.Касірэр пашырыў змест паняцця С. і разглядаў у якасці сімвалічных усе формы дзейнасці чалавека (мову, рэлігію, мастацтва і навуку). *В.М.Пешкаў.*

СІ́МВАЛ ВЕ́РЫ, кароткі збор *догматаў рэлігійных*, якія складаюць аснову веравучэння пэўнай рэлігіі. Агульнахрысц. (Нікея-Царградскі) С.в. складзены *айцамі царквы*, замацаваны на Нікейскім (325) і Канстанцінопальскім (381) *усяленскіх саборах*, уключае 12 частак аб трыадзінстве Бога, аб Хрысце як зямным увасабленні Бога, другім прышэсці на зямлю, выратавальнай місіі царквы, неабходнасці хрышчэння, веры ва ўваскрэсенне памерлых, страшным судзе і інш. Свае С.в. распрацоўвалі асобныя хрысц. плыні (манафізіты, нестарыяне і інш.). Зах.-хрысц. царква ў 589 дапоўніла С.в. філіёкве (догмат ад зыходжанні Св. Духа і ад Бога-Айца, і ад Бога-Сына), што паслужыла адной з падстаў для *падзелу цэркваў*. Падрабязнае тлумачэнне С.в. даецца ў *катэхізісах*, катэхізічных павучаннях, «спавяданні веры».

Да арт. **Сімвалізм**. П.Гаген. Страта цнатлівасці (Абуджэнне вясны).

СІМВАЛІ́ЗМ (франц. symbolisme ад грэч. symbolon знак, сімвал), літаратурна-мастацкі кірунак канца 19 — пач. 20 ст. Узнік у выніку агульнага крызісу еўрап. свядомасці, узыходзіць да эстэтыкі *рамантызму*. Філас. падмуркам паслужылі вучэнне Платона аб проціпастаўленні ідэальнага свету («свету ўяўленняў») і матэрыяльнага («свету рэчаў»), філас. тэорыі І.Канта, А.Шапенгаўэра, Э.Гартмана, Ф.Ніцшэ, навук. адкрыцці псіхолагаў і псіхафізіёлагаў з іх увагай да пазасвядомага. Аб'ектыўна С. адмаўляў філасофію пазітывізму і яго маст. рэалізацыю *натуралізм*. Асн. прызначэнне мастацтва сімвалісты бачылі ў пазнанні Абсалюту, Вечнасці, трансцэндэнтнай Красы, што здзяйсняецца творцам праз сімвал, які пры гэтым пазбаўляецца канкрэтнасці, дакладнасці, «празрыстасці» зместу, робіцца полісемічным, не паддаецца аднаварыянтнай дэшыфроўцы. У выніку замест апісальнай мовы ствараласа мова сугестыўная, г.зн. вобразна-сімвалічнае спасціжэнне таемных сутнасцей быцця адбываецца праз інтуіцыю, унушэнне, паэт. «магію». Сімвалісты распрацоўвалі ўспрынятую ад рамантыкаў ідэю *сінтэзу мастацтваў*, услед за Ш.Бадлерам кіраваліся прынцыпам «адпаведнасцей», заснаваным на зрокавых, слыхавых, фарбавых, вербальных асацыяцыях, на аналогіях гукаў, пахаў, колераў, вобразаў. С. стаў асновай узнікнення *сюррэалізму*, *«тэатра абсурду»*.

У л і т а р а т у р ы пачаў складвацца ў 1860—70-я г., яго светапогляднае абгрунтаванне прыпала пераважна на 1880—90-я г. (цыкл нарысаў «Праклятыя паэты» П.Верлена, «Літаратурны маніфест. Сімвалізм» Ж.Марэаса, працы «Сімвалісцкае мастацтва» Ж.Ванора, «Нямецкія рамантыкі і французскія сімвалісты» Ж.Тарэля, «Трактат пра Нарцыса. Тэорыя сімвала» А.Жыда і інш.). Папярэднікам С. лічыцца Бадлер. Сфарміраваўся С. найперш у франц. л-ры (Верлен, А.Рэмбо, С.Малармэ, Латрэамон, А. дэ Рэнье, Жыд, П.Валеры, П.Кладэль), у рознай ступені развіўся ў л-рах бельгійскай (М.Метэрлінк, Э.Верхарн), аўстр. (Р.М.Рыльке, Г. фон Гофмансталь), ням. (Ніцшэ, С.Георге), нарв. (Г.Ібсен), польскай (С.Пшыбышэўскі), рус. (В.Брусаў, А.Блок, Ф.Салагуб, К.Бальмонт, А.Белы, Дз.Мережкоўскі, З.Гіпіус, І.Аненскі, В.Іванаў). Сімвалісты часта звярталіся да стараж. і сярэдневяковых сюжэтаў, увялі «свабодны верш», ці верлібр, шырока выкарыстоўвалі прынцып цыклізацыі вершаў. Вял. ўвагу яны аддавалі рытму, меладычнасці, напеўнасці, музычнасці верша, што збліжае С. з *імпрэсіянізмам*. Часта С. у аднаго аўтара і нават у адным творы спалучаецца з імпрэсіянізмам, эстэтызмам, натуралізмам, неарамантызмам.

У в ы я ў л е н ч ы м м а с т а ц т в е (пераважна ў жывапісе і графіцы) узнік і развіваўся пад уплывам аднайм. літ. кірунку, зазнаў уплывы містычных і спірытуалістычных вучэнняў, *дэкадэнцтва*. У пошуках новага, неалегарычнага спосабу выяўлення эстэт. ідэалу імкнуўся даследаваць і адлюстроўваць няўлоўныя сэнсавыя адценні і псіхічны стан чалавека, яго непарыўную сувязь з прыродай, праяўленні звышнатуральных сіл, якія кіруюць лёсам. Адзінай стылістычнай сістэмы не распрацаваў, развіваўся ў рэчышчы асн. маст. кірункаў. Вытокі С. ў творчасці *прэрафаэлітаў*. Развіўся ў творчасці Г.Маро, А.Рэдона, П.Пюві дэ Шавана, П.Гагена (Францыя), М.Клінгера (Германія), Э.Мунка (Нарвегія), Э. Бёрн-Джонса (Вялікабрытанія), А.Бёкліна (Швейцарыя), Дж.Сеганціні (Італія), М.Чурлёніса (Літва), Л.Бакста, В.Барысава-Мусатава, А.Бенуа, І.Білібіна, В.Васняцова, П.Кузняцова, М.Рэрыха, М.Урубеля (Расія), мастакоў групы *«Набі»* і інш.

У т э а т р ы С. узнік у Францыі (студыйныя т-ры сімвалісцкага кірунку ў Парыжы), распаўсюдзіўся ў Германіі і інш. краінах Зах. Еўропы, у пач. 20 ст. — у Расіі. Ідэі С. ў драм. творах Метэрлінка і Верхарна (Бельгія), А.Стрындберга (Швецыя), Пшыбышэўскага (Польшча), позняй творчасці Ібсена (Нарвегія), А.Блока, Іванава, Салагуба, Л.Андрэева (Расія). У драме слова ўспрымалася як матэрыяльная катэгорыя, асаблівая ўвага аддавалася падтэксту, недагаворкам герояў, іх маўчанню. У сцэн. мастацтве асн. намаганні скіроўваліся на дасягненне сінтэзу розных мастацтваў: муз., выяўл., пластычнага, якім адводзілася вял. месца ў спектаклі. Характэрна імкненне да стылізацыі драм. форм мінулага (стараж.-грэч. трагедый, сярэдневяковых містэрый і міракляў), устанаўленне на сцэне поўнага дыктату рэжысёра — паэт. атмасферу ў спектаклі прапаноўвалася ўзмацніць заменай акцёра марыянеткамі. С. праявіўся ў творчасці рэж. А.Апія (Швейцарыя), Г.Крэга (Англія), Г.Фукса і часткова М.Райнгарта (Германія), на асобных этапах творчасці У.Меерхольда (Расія) і інш.

У л-ры і мастацтве Беларусі С. не склаўся ў самаст. кірунак, аднак паўплываў на іх развіццё. У пач. 20 ст. творы рознанац. прадстаўнікоў С. актыўна абмяркоўваліся ў бел. друку (газ. «Минский листок», «Северо-Западный край», «Минский курьер», «Голос провинции», «Минское эхо», «Полесье», «Беларусь» і інш.). Мела месца вульгарна-сацыялагічнае тлумачэнне С. і памяркоўнае, дыферэнцыраванае стаўленне да яго. Найбольш эстэтыка С. паўплывала на творчасць М.Багдановіча, які яшчэ ў гімназічных паведамленнях звяртаўся да праблем, звязаных з новым кірункам («Новыя павевы ў літаратуры», «Сучасная літаратура і народны дух», «Сімвалізм і дэкадэнцтва»). Ён уважліва ставіўся да новых выданняў сімвалісцкай паэзіі, пераклаў на бел. мову творы Верлена (22 вершы), Верхарна (урывак «Паўстанне»), асобных рус. сімвалістаў.

Філас.-эстэт. прысутнасцю С. адметны яго паэт. цыкл «Думы» («Мы доўга плылі ў бурным моры...», «Мне снілася», «Шмат у нашым жыцці ёсць дарог...» і інш.), вершы, што суадносяцца з творчасцю Верлена, Ібсена, Бальмонта, Блока. Рысы С. выявіліся і ў творах Я.Купалы, З.Бядулі, К.Буйло, М.Гарэцкага, У.Жылкі, у літ. спадчыне Я.Драздовіча, у творчасці пісьменнікаў бел. эміграцыі (Н.Арсеннева, А.Салавей, Я.Юхнавец). Элементы сімвалісцкай эстэтыкі ў розных формах праявіліся і ў сучаснай бел. л-ры (А.Разанаў, А.Кірвель і інш.). У бел. сцэн. мастацтве выкарыстоўваліся асобныя рысы і вобразна-маст. сродкі С. У пач. 20 ст. рас. тэатр. калектывы ставілі на Беларусі творы Андрэева, Ібсена і інш. Маст. сімвалы ўласцівы і відовішчам масавых дзействаў («Праца і капітал», паст. 1.5.1921 Е.Міровіча, Л.Літвінава і Бейтлера на Мінскім трэку). Прыёмы С. (наданне першаступеннага значэння пластыцы, музыцы, святлу ў спектаклі, стварэнне ў ім паэт. атмасферы, перадача метафарычнай знакавасці) актыўна выкарыстоўваюцца для пашырэння выяўл. сродкаў сцэн. мастацтва рэжысёрамі В.Катавіцкім («За зачыненымі дзвярыма» Ж.П.Сартра ў Дзярж. маладзёжным т-ры, 1992), М.Труханам («Распад» паводле У.Шэкспіра ў Мінскім драм. т-ры «Дзе-Я?», 1997), В.Раеўскім («Чорная панна Нясвіжа» А.Дударава ў Нац. т-ры імя Я.Купалы, 2000), В.Баркоўскім («Зямля» паводле твораў Я.Коласа ў Нац. т-ры імя Я.Коласа, 2001) і інш.

Да арт. **Сімвалізм**. Э.Бёрн-Джонс: Кола фартуны. 1883.

Літ.: Конан У.М. Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі (1917—1934 гг.). Мн., 1968; Яго ж. Проблемы искусства и эстетики в общественной мысли Белоруссии начала XX в. Мн., 1985; Обломиевский Д.Д. Французский символизм. М., 1973; Ермилова Е.В. Теория и образный мир русского символизма. М., 1989; Белый А. Символизм как миропонимание. М., 1994; Васючэнка П. Славянскі сімвалізм: Нац.-адметнае і агульнае. Мн., 1998; Лявонава Е.А. Плыні і постаці: З гісторыі сусвет. літ. другой паловы XIX—XX стст. Мн., 1998; Тарасюк Л.К. Мастацкія кірункі і плыні ў беларускай паэзіі XIX — пачатку XX ст. Мн., 1999; Cassou J. Encyklopedia symbolizmu: Przekl. z fr. Warszawa, 1992. *Е.А.Лявонава, А.В.Сабалеўскі.*

СІ́МВАЛЫ ХІМІ́ЧНЫЯ, гл. *Знакі хімічныя.*

СІМВО́ЛІКА, 1) арганізаваная сістэма *сімвалаў*, створаная чалавекам для спрашчэння перадачы *інфармацыі*. Характэрна для кожнай сферы матэрыяльнага і духоўнага свету чалавека: С. мовы, жэстаў, мастацтва, абрадаў, міфаў, паданняў, гульні, магіі і да т.п. Чалавек выступае ў якасці кіраўніка і каардынатара структурнай цэласнасці і функцыянальнасці С. У кожным грамадстве яна фарміруецца на пэўным этапе гіст. развіцця ў адпаведнасці з базавымі прынцыпамі канструявання ў грамадскай свядомасці касмалагічных і антрапалагічных вобразаў, уяўленняў пра мікра- і макракосм. С. падпарадкоўваецца прынцыпам паслядоўнасці (стварэнне на аснове аднолькавых перадумоў і матываў, агульных навук., эстэт. і этычных установак, што пануюць у грамадстве, сімвалаў, сінанімічных па змесце і форме), несупярэчнасці (адсутнасць сімвалаў, што маюць некалькі значэнняў, у т.л. процілеглых адно аднаму), усеагульнасці, абумоўленай сімвалічнай прыродай чалавечай культуры і заснаванай на неабходнасці мінімізацыі затрат пры апрацоўцы інфармацыі. На кожным з падраздзелаў С. (элементным, структурным, сістэмным) сімвал набывае семантычныя, стылістычныя і сэнсавыя нагрузкі. Чым больш строгая і менш скажоная сувязь паміж сімвалам і сутнасцю, якую ён сімвалізуе, тым вышэй роля семантычнага зместу ў функцыянальнай накіраванасці С. (напр., магічная і навук. С.). Чым больш складаныя і выразныя фармальныя якасці сімвала, тым вышэй значэнне стылістычных параметраў С. (напр., С. мастацтва і міфалогіі). Дамінаванне сэнсавага зместу сімвала выяўляецца ў дакладным адлюстраванні ў С. сац. норм і арыенціраў (напр., С. этыкету, рытуалаў, геральдыкі і інш.). Семантычная нагрузка С., адрозненне ад стылістычнай і сэнсавай, менш рухомая і з развіццём грамадства фактычна не мяняецца. 2) Навука, якая вывучае эвалюцыю *семантыкі* сімвалаў. Гал. праблемы С. — прырода сімвала; дынаміка ўзаемадзеяння сімвалаў у межах пэўнай сімвалічнай сістэмы; умовы супрацьстаўлення элементаў чужародных сімвалічных сістэм. Асн. прынцып С. — выкарыстанне прыёмаў і падыходаў *сістэмнага аналізу*. Гал. задача С. — выяўленне ступені скажэння значэння сімвалаў на кожным сістэмным падраздзеле (элементным, структурным і сістэмным). Часам у якасці сіноніма «С.» выкарыстоўваюць тэрміны «сімбалогія», «сімвалазнаўства», «сімволіказнаўства».

А.Р.Жаўняк, І.І.Мячыкава.

Ж.Сіменон.

СІМЕІ́З, прыморскі кліматычны курорт у Крыме, на ПдЗ ад г. Ялта, Украіна. Клімат субтрапічны міжземнаморскага тыпу. Прыродна-кліматычныя асаблівасці станоўча ўплываюць на правядзенне *клімататэрапіі* хворых на туберкулёз (профіль курорта). Санаторыі, дамы адпачынку, драбнагалечны пляж, вял. парк з вечназялёнымі дрэвамі і кустамі. Купальны сезон з чэрв. па кастрычнік.

СІМЕНО́Н (Simenon) Жорж (13.2.1903, г. Льеж, Бельгія — 4.9.1989), французскі пісьменнік. Чл. Бельг. каралеўскай акадэміі (з 1952). З 1922 жыў у Францыі, з 1955 — у Швейцарыі. Падарожнічаў па Еўропе і Афрыцы, займаўся журналістыкай. Як пісьменнік фарміраваўся пад уплывам рус. л-ры. Друкаваўся з 1919. Славу прынеслі дэтэктыўныя раманы з сусв. вядомым героем камісарам Мегрэ: «Запіскі Мегрэ» (1950), «Мегрэ падарожнічае» (1958), «Мегрэ і бадзяга» (1963), «Мегрэ сумняваецца» (1968), «Мегрэ і мсье Шарль» (1972) і інш. У сац.-псіхал. раманах «Дом на канале» (1933), «Негрыцянскі квартал» (1935), «Бруд на снезе» (1948), «Браты Рыко» (1952), «Сын» (1957), «Прэзідэнт» (1958), «Турма» (1968), «І ўсё ж такі арэшнік зелянее» (1969) і інш. выкрываў расізм і галечу, каланіялізм і фашызм. Яго проза адметная ўважлівым стаўленнем да дэталі, дакладнай матывацыяй паводзін персанажаў, іх моўнай індывідуалізацыяй, псіхалагізмам у спалучэнні з займальнай інтрыгай і сюжэтным дынамізмам. Аўтар цыкла ўспамінаў «Я дыктую» (т. 1—21, 1975—81), літ.-крытычных прац, аўтабіягр. кніг, аповесцей і апавяданняў. Некат. яго творы экранізаваны. На бел. мову асобныя творы С. пераклалі Н.Мацяш, А.Асташонак.

Тв.: Бел. пер. — Першая справа Мегрэ. Мн., 1982; Пад страхам смерці: Раман, аповесці. Мн., 1992; Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—20. М., 1991.

Літ.: Шрайбер Э.Л. Жорж Сименон: Жизнь и творчество. Л., 1983.

Е.А.Лявонава.

СІ́МЕНС (Siemens) Эрнст Вернер (13.12.1816, г. Гердэн, Германія — 6.12.1892), нямецкі электратэхнік і прамысловец. Чл. Берлінскай АН (1874). Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1882). Скончыў Берлінскае артыл. інж. вучылішча. Атрымаў патэнт на ўдасканалены тэлегр. апарат (1847). У 1853—56 прымаў удзел у буд-ве тэлегр. ліній у Расіі, кіраваў стварэннем першай трамвайнай лініі на прамысловай выстаўцы ў Берліне (1879). Займаўся пытаннямі моцнатокавай электратэхнікі (эл. асвятленне, трамвай, электрастанцыі і інш.). Сканструяваў шэраг эл.-тэхн. прыстасаванняў і прылад (ртутны эталон супраціўлення, селенавы фатометр і інш.). Заснаваў эл.-тэхн. канцэрны «Сіменс і Гальске», «Сіменс і Шукерт» і інш. Яго імем названа адзінка эл. праводнасці — *сіменс*.

Літ.: Радовский М.И. В.Сименс, 1816—1892 // Пионеры машинной индустрии. М.; Л., 1937.

СІ́МЕНС, адзінка *электраправоднасці* ў Міжнар. сістэме адзінак (СІ). Названа ў гонар Э.В.*Сіменса*. Абазначаецца См. С. роўны эл. праводнасці правадніка (участка эл. ланцуга) з эл. супраціўленнем 1 Ом: 1 См = 1 Ом$^{-1}$. У практыцы вымярэнняў выкарыстоўваюцца кратныя і дольныя адзінкі: кіласіменс (10^3 См), мілісіменс (10^{-3} См) і мікрасіменс (10^{-6} См).

«СІ́МЕНС» (Siemens), буйная транснацыянальная карпарацыя Германіі па вырабе электроннага, энергасілавога, электратэхнічнага, мед., вайск і інш. абсталявання. Засн. Э.В.*Сіменсам* у Берліне ў 1847. На 1.1.2001 на прадпрыемствах «С.», якія знаходзяцца ў 190 краінах свету, працавала больш за 440 тыс. чал. У 1999/2000 фін. годзе грашовае абарачэнне карпарацыі склала 78,4 млрд. еўра, прыбытак — 3,4 млрд. Каля 70% даходу атрымана ад аперацый, якія вядуцца за межамі Германіі.

СІМЕНТА́ЛЬСКАЯ ПАРО́ДА (ад ням. Simmental Зіментальская даліна), парода буйн. раг. жывёлы малочна-мясного кірунку. Выведзена ў Швейцарыі па-

Карова **сіментальскай пароды**.

ляпшэннем мясц. парод. Адна з найб. пашыраных парод у свеце. Выкарыстоўвалася пры вывядзенні роднасных (сіменталізаваных) груп буйн. раг. жывёлы (у Германіі — флэкфі, у Францыі — манбельярдская, у Венгрыі — венгерская пярэстая і інш.); у СССР — бястужаўскай, чырв. тамбоўскай, сычоўскай пародаў.

Паводле целаскладу існуе некалькі народных груп: груба- і тонкакасцявыя, высака- і нізканогія і інш. Маса быкоў 800—1100, кароў 550—600 кг. Масць палева-пярэстая, зрэдку чырв.-пярэстая. Сярэдні гадавы надой 3500—4000 кг, тлустасць малака 3,8—3,9%. Мясныя якасці здавальняючыя (забойны выхад каля 60%).



Сіметрыя ў геаметрыі. Плоскія фігуры, сіметрычныя адносіны прамой *a* (1) і пункта *O* (2).

СІМЕТРЫ́Я (ад грэч. symmetria суразмернасць), у шырокім сэнсе — нязменнасць (інварыянтнасць) структуры, уласцівасцей, формы матэрыяльнага аб'екта адносна пэўных пераўтварэнняў (змены яго становішча ў прасторы, фіз. умоў і інш.).

СІМЕТРЫ́Я ў геаметрыі, уласцівасць геаметрычнай фігуры пры вызначаных пераўтварэннях (зменах свайго становішча) сумяшчацца з самой сабой так, што не ўсе яе пункты займаюць першапачатковае месца ў прасторы.

Віды С. на плоскасці: С. адносна прамой (восі С.) пры люстраным адбітку (кожнаму пункту фігуры адпавядае іншы пункт гэтай фігуры на перпендыкуляры да дадзенай прамой на той жа адлегласці ад яе), напр., круг сіметрычны адносна кожнай прамой, якая праходзіць праз яго цэнтр; С. адносна пункта (цэнтра С.), калі фігура супадае сама з сабой пры яе вярчэнні на 180°, напр., паралелаграм сіметрычны адносна пункта перасячэння дыяганалей; С. парадку *n* адносна пункта (цэнтра С. парадку *n*), калі фігура супадае сама з сабой пры вярчэнні на 360°/*n*, *n* = 3, 4, 5, ..., напр., правільны *n*-вугольнік; С. бесканечнага парадку адносна пункта (цэнтра С. бесканечнага парадку), калі фігура супадае сама з сабой пры вярчэнні на адвольны вугал вакол цэнтра, напр., круг і ўся плоскасць. Паняцце С. абагульняецца на цэлы ў прасторы, а таксама на інш. матэм. паняцці (група, аператар і інш.) і адыгрывае значную ролю ў матэматыцы і яе дастасаваннях.

А.А.Гусак.

СІМЕТРЫ́Я ў фізіцы, незалежнасць фіз. сістэм і з'яў, а таксама прастораў, у якіх існуюць матэрыяльныя аб'екты і працякаюць рэальныя працэсы, ад пэўных аперацый над імі (зрухаў, паваротаў, адбіццяў, перастановак і інш.). Матэматычна ўласцівасці С. адпавядаюць *інварыянтнасці* фіз. тэорый (ураўненняў руху і станаў, фіз. законаў і інш.) адносна пераўтварэнняў С., якія ў сукупнасці вызначаюць адпаведныя *групы* С.

Ідэі і прынцыпы С. адыгрываюць канструктыўную ролю пры пабудове фіз. тэорый. Напр., спец. *адноснасці тэорыя* — па сутнасці фіз. тэорыя С. прасторы і часу. Выразы *аператараў* фіз. велічынь у *квантавай механіцы* вызначаюцца праз генератары груп С. Класіфікацыя *элементарных часціц* заснавана на ўліку і выкарыстанні геам. (прасторава-часавай) і ўнутранай (ізатапічнай, унітарнай і інш.) С. Для тэорый *узаемадзеянняў элементарных часціц* абавязковай з'яўляецца інварыянтнасць адносна *Лорэнца пераўтварэнняў* і пераўтварэнняў адпаведнай дынамічнай С. (гл. *Калібровачная інварыянтнасць*). Паслядоўны ўлік уласцівасцей С. дазволіў абгрунтаваць справядлівасць законаў захавання фіз. велічынь (гл. *Нётэр тэарэма*) паводле схемы: С. — інварыянтнасць — закон захавання (напр., аднароднасць часу — інварыянтнасць тэорыі адносна зрухаў пачатку адліку часу — закон захавання энергіі). У квантавай фізіцы разглядаюцца таксама дыскрэтныя С.: зарадавае спалучэнне, прасторавая інверсія і абарачэнне часу (гл. *Людэрса — Паўлі тэарэма*). Важнае значэнне мае вывучэнне магчымых парушэнняў С. ў фіз. сістэмах. Адкрыцці парушэнняў прасторавай і камбінаванай С. сталі вызначальнымі для пабудовы тэорыі слабых (электраслабых) узаемадзеянняў. З парушэннямі сферычнай С. ў атаме за кошт узаемадзеяння электронаў з эл. ці магн. полем звязана адпаведнае расшчапленне спектральных ліній (гл. *Зеемана з'ява*, *Штарка з'ява*). Фіз. С. — аснова класіфікацыі крышталёў (гл. *Сіметрыя крышталёў*), выкарыстоўваецца ў даследаваннях па оптыцы і акустыцы крышталёў, пры пабудове агульнай тэорыі аптычнай анізатропіі (гл. *Каварыянтныя метады*), а таксама ў атамнай, малекулярнай і ядз. спектраскапіі.

Літ.: Вигнер Е. Этюды о симметрии: Пер. с англ. М., 1971; Федоров Ф.И. Теория гиротропии. Мн., 1976; Яго ж. Группа Лоренца. М., 1979; Богуш А.А. Очерки по истории физики микромира. Мн., 1990.

А.А.Богуш.

СІМЕТРЫ́Я КРЫШТАЛЁЎ, уласцівасць *крышталёў* заканамерна паўтараць аднолькавыя грані, рэбры, вяршыні або сумяшчацца з сабой пры паваротах вакол восі, у прамых і перавернутых адлюстраваннях, паралельных пераносах і інш.; аснова класіфікацыі крышталёў. Сіметрыя знешняй формы (агранкі) крышталя залежыць ад сіметрыі яго атамнай будовы або *крышталічнай рашоткі*, якая абумоўлівае сіметрыю яго фіз. уласцівасцей. Форма крышталя і сіметрыя ўнутр. яго будовы вызначаюцца з дапамогай элементаў сіметрыі. Гал. элемент С.к. — паваротныя восі сіметрыі 1—4-га і 6-га парадкаў, плоскасць люстэркавага адлюстравання і цэнтр сіметрыі. Перавернутыя адлюстраванні вызначаюцца інверсійнымі восямі і

цэнтрам сіметрыі. Інверсійныя восі маюць тыя ж парадкі, што і асн. восі. Парадак паваротнай восі сіметрыі паказвае, колькі разоў крышталь сумяшчаецца з сабой пры павароце на 360° (напр., куб — 4 разы, 6-гранная прызма — 6 разоў). Плоскасць сіметрыі падзяляе крышталь на 2 палавіны, якія люстэркава адлюстроўваюцца. Восі і плоскасць праходзяць праз цэнтр сіметрыі, што ўяўляе сабой пункт унутры фігуры, адносна якога ўсе супрацьлеглыя падобныя элементы крышталя знаходзяцца на аднолькавай адлегласці. Існуюць таксама элементы С.к.: плоскасць слізготнага люстэркавага адлюстравання (камбінацыя адлюстравання ў плоскасці з адначасовай трансляцыяй) і вінтавая вось (сумяшчае паварот і трансляцыю ўздоўж восі павароту, мае 2-і—4-ы і 6-ы парадкі). Пэўная сукупнасць элементаў сіметрыі ў адным крышталі вызначае від (групу, клас) сіметрыі. Вядомы 32 віды размяшчэння элементаў сіметрыі ў трохмернай прасторы, вызначаныя ням. мінералогам І.Геселем (1830), у больш строгай матэм. форме — рус. вучоным А.В.Гадаліным (1867). Віды сіметрыі групуюцца ў 7 крышталеграфічных сістэм (*сінганій*). Найб. сіметрычны від С.к. кожнай сінганіі наз. галаэдрычным. Крышталі аднаго мінералу маюць адзін від сіметрыі і пастаянны вугал паміж дзвюма адпаведнымі гранямі. С.к. вывучае *крышталяграфія*. З дапамогай С.к. вызначаюць мінералы і іх уласцівасці.

Літ.: Современная кристаллография. Т. 1. Вайнштейн Б.К. Симметрия кристаллов. Методы структурной кристаллографии. М., 1979; Егоров-Тисменко Ю.К., Литвинская Г.П., Загальская Ю.Г. Кристаллография. М., 1992. *В.І.Ярцаў.*

СІМІНО́ЎСКІ Майсей Ісакавіч (16.10.1900, в. Мормаль Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. — 5.11.1984), генерал-маёр (1944). Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1934), Вышэйшыя акад. курсы (1948). У Чырв. Арміі з 1920. Удзельнік грамадз. вайны. У Вял. Айч. вайну на Зах., Калінінскім, 1-м Прыбалт., 3-м Бел., Забайкальскім франтах: нач. штаба дывізіі, арміі. Удзельнік баёў пад Масквой, Велікалуцкай, Віцебска-Аршанскай, Усх.-Прускай, Хінгана-Мукдэнскай аперацый. У 1952—61 выкладчык Ваен. акадэміі імя Фрунзе.

СІМІРЭ́НКА Леў Платонавіч (18.2.1855, с. Мліеў Корсунь-Шаўчэнкаўскага р-на Чаркаскай вобл., Украіна — 8.1.1920), украінскі вучоны ў галіне пладаводства і памалогіі. Скончыў Адэскі ун-т (1879). У 1887 заклаў у с. Мліеў матачны калекцыйны сад і памалагічны расаднік (каля 3 тыс. раслін) і праводзіў там выпрабаванні, шляхам клонавага адбору стварaў новыя сарты. У 1921 на базе саду створана Мліеўская доследная станцыя садоўніцтва, якая з 1958 носіць яго імя.

Тв.: Крымское промышленное плодоводство. М., 1912; Помология. Т. 1—3. 2 изд. Киев, 1972—73.

СІ́МЛА, Шымла, горад на Пн Індыі, у перадгор'ях Гімалаяў, на выш. больш за 2 тыс. м. Адм. ц. штата Хімачал-Прадэш. Каля 150 тыс. ж. (2001). Канцавы пункт вузкакалейнай чыгункі і шашы. Аэрапорт. Ун-т. Горна-кліматычны курорт. Навук. цэнтр.

СІМО́Н (Simon) Клод (н. 10.10.1913, Антананарыву, Мадагаскар), французскі пісьменнік; прадстаўнік *«новага рамана»*. Вучыўся ў Парыжы, Оксфардзе і Кембрыджы. На яго эстэт. фарміраванне паўплывалі У.*Фолкнер* і экзістэнцыялісты (асабліва А.*Камю*). Асн. тэмы яго твораў — мастацтва і вайна, асоба і гісторыя, чалавек сярод людзей. Аўтар раманаў «Вясна свяшчэнная» (1954), «Вецер» (1957), «Трава» (1958), «Дарогі Фландрыі» (1960), «Атэль «Палас» (1962), «Гісторыя» (1967), «Фарсальская бітва» (1969), «Трыпціх» (1973), «Урок рэчаў» (1975), «Георгікі» (1981), «Акацыя» (1989), кніг успамінаў, літ. эсэ, у якіх выклаў свае погляды на «новы раман». Творы С. адметныя падкрэсленай эксперыментальнасцю, адмаўленнем ад храналогіі, персанажа і сюжэта ў традыц. сэнсе, прасторава-часавымі напластаваннямі, знешняй алагічнасцю і кампазіцыйнай фрагментарнасцю, разгорнутымі апісаннямі і перанасычанасцю дэталямі, выкарыстаннем «плыні свядомасці», часам пунктуацыйнай ускладненасцю. Нобелеўская прэмія 1985.

К.Сімон.

Тв.: Рус. пер. — Дороги Фландрии // Бютор М. Изменение; Роб-Грийе А. В лабиринте; Симон К. Дороги Фландрии; Саррот Н. Вы слышите их? М., 1983.

Літ.: Еремеев Л.А. Французский «новый роман». Киев, 1974; Французская литература, 1945—1990. М., 1995. *Е.А.Лявонава.*

СІМПАДЫЯ́ЛЬНАЕ ГАЛІНАВА́ННЕ, гл. ў арт. *Галінаванне*.

СІМПАТАЛІТЫ́ЧНЫЯ СРО́ДКІ (лац. sympatholytica здольны растварaць, аслабляць), лекавыя сродкі, якія парушаюць перадачу нерв. імпульсаў з сімпатычных нерваў на выканаўчыя органы. Да С.с. адносяцца рэзерпін, метылдопа, актадзін, арнід, якія ўздзейнічаюць на канцы сімпатычных нерваў. Асн. эфекты С.с. звязаны з прыгнечаннем *сімпатычнай нервовай сістэмы* і дамінаваннем актыўнасці парасімпатычнай нерв. сістэмы: змяншэнне артэрыяльнага ціску, узмацненне маторнай і сакраторнай функцый страўніка, кішэчніка і інш. Выкарыстоўваюць для лячэння артэрыяльнай гіпертаніі, пры глаўкоме, сардэчных арытміях. *І.М.Семяненя.*

СІМПАТРЫ́Я (ад грэч. syn разам + patris радзіма), тып *відаўтварэння*, пры якім новыя *віды* ўзнікаюць з папуляцый з моцна перакрыжаванымі або супадаючымі *арэаламі*. Магчыма ў выпадках, калі 2 формы, якія існуюць у межах агульнага арэала або яго часткі, не змешваюцца і маюць розныя экалагічныя нішы. Супрацьлеглы выпадак — відаўтварэнне з папуляцый з неперакрыжаванымі арэаламі — наз. *алапатрыяй*.

С. наз. таксама сумеснае пражыванне ў адным геагр. раёне розных відаў або ўнутрывідавых груп арганізмаў (біял. *рас*), якія адрозніваюцца генетычна, з рознымі экалагічнымі асаблівасцямі (тэрміны і месцы размнажэння, аб'екты корму, спосабы здабычы корму і інш.). Напр., «азімыя» і «яравыя» расы некат. ласосепадобных і асетрападобных рыб нерасяцца ў адных вадаёмах, але ў розныя тэрміны, што робіць немагчымым абмен спадчыннай інфармацыяй паміж імі.

СІМПАТЫ́ЧНАЯ НЕРВО́ВАЯ СІСТЭ́МА (ад грэч. sympathēs чуллівы, успрымальны), частка *вегетатыўнай нервовай сістэмы* пазваночных. Прымае ўдзел у падтрыманні *гамеастазу*, спрыяе хуткай мабілізацыі фізіял. функцый арганізма, стымулюе працэсы *катабалізму*. Мае цэнтры, якія знаходзяцца ў бакавых рагах грудных і паяснічных сегментаў спіннога мозга, у нерв. вузлах (*гангліях*), размешчаных па баках пазваночніка (паравертэбральныя) і ў брыжэйцы (прэвертэбральныя гангліі). Прэвертэбральныя гангліі здольныя ўтвараць рыхлыя скопішчы, звязаныя валокнамі, — нерв. спляценні (буйнейшае з іх — сонечнае). Гангліі злучаны паміж сабой, са спінным мозгам, з выканаўчымі органамі. С.н.с. інервуе крывяносныя сасуды і ўнутр. органы, што забяспечвае рэфлекторную ўзаемасувязь паміж імі, а характэрнае для гэтай сістэмы галінаванне нерв. ствалоў спрыяе генералізаванаму ўплыву на некалькі ўнутр. структур. *Медыятары* С.н.с. — *ацэтылхалін* (прэгангліянарныя валокны) і *норадрэналін* (постгангліянарныя валокны, акрамя тых, што інервуюць потавыя залозы). *А.С.Леанцюк.*

СІМПА́ТЫЯ (ад грэч. sympathēia спачуванне, прыхільнасць), устойлівыя станоўчыя эмацыянальныя адносіны аднаго чалавека да другога; процілеглае *антыпаты*. Узнікае на аснове агульных поглядаў, каштоўнасцей, інтарэсаў, ідэалаў. Адзін з фактараў інтэграцыі людзей і захоўвання псіхал. камфорту. Гл. таксама *Атракцыя*.

СІ́МПЛЕКСНАЯ СУ́ВЯЗЬ (ад лац. simplex просты), сістэма двухбаковай *электрасувязі* паміж двума абанентамі па адным фіз. ланцугу ці па адным канале сувязі, пры якой прыём і перадача паведамленняў праводзіцца пачаргова. Пры тэлеф. С.с. для двухбаковай перадачы паведамленняў карыстаюцца спец.

прыладамі для змены напрамку перадачы (уручную — кнопкай, аўтаматычна — ад голасу). Гл. таксама *Дуплексная сувязь*.

СІМПО́ЗІУМ (лац. symposium ад грэч. symposion баляванне, банкет), 1) вячэрняе ці начное баляванне ў стараж. грэкаў і рымлян, якое суправаджалася музыкай, бяседай, рознымі забавамі. 2) Нарада, у т.л. міжнар., па якім-н. навук. пытанні (напр., С. па праблемах гепатыту).

СІ́МПСАН (Simpson), пустыня ў цэнтр. ч. Аўстраліі. Пл. каля 300 тыс. км^2. Паверхня пераважна пясчаная з паралельнымі градамі даўж. да 250 км, выш. да 30 м, якія распасціраюцца ў паўн.-зах. кірунку пануючых вятроў; на ПдУ — пясчана-галечнікавая, на З — камяністая, каля берагоў воз. Эйр — гліністая. Сярэдняя т-ра студз. 28—30 °С, ліп. 12—15 °С. Ападкаў да 130 мм за год. Багатая падземнымі водамі. Рэдкая расліннасць з акацый і эўкаліптаў; дзернавінны злак спініфекс. Нац. парк Сімпсан-Дэзерт. Названа імем прэзідэнта геагр. т-ва Аўстраліі.

СІМПТАМАТЫ́ЧНАЯ ТЭРАПІ́Я, від лячэння, накіраваны на ўстараненне або аслабленне асобных *сімптомаў* хваробы. Напр., назначэнне гарачкапаніжальных сродкаў пры ліхаманцы, анальгетыкаў пры болях, процікашлевых сродкаў пры захворваннях органаў дыхання, сардэчных гліказідаў пры сардэчнай недастатковасці і інш. У многіх выпадках адыгрывае ролю патагенетычнай тэрапіі, якая ўздзейнічае на механізмы развіцця хваробы (напр., назначэнне анальгетыкаў пры інфаркце міякарда). Да С.т. адносяцца і некат. бязлекавыя прыёмы фізіятэрапіі (напр., выкарыстанне магнітных палёў для змяншэння болю). *І.М.Семяненя.*

СІМПТО́М (ад грэч. symptōma супадзенне, прыкмета), характэрнае праяўленне або прыкмета хваробы. Бываюць С. суб'ектыўныя, пра якія хворы паведамляе ўрачу (напр., боль, слабасць), і аб'ектыўныя (вызначаюцца ўрачом у час абследавання); агульныя, характэрныя для многіх хвароб (напр., павышэнне т-ры) і патагнаманічныя, характэрныя толькі для пэўнага захворвання (напр., болі ў вобласці паясніцы пры хваробе нырак).

СІМУЛЯ́ЦЫЯ (ад лац. simulatio няшчырасць, прытворства), *паводзіны*, накіраваныя на імітацыю хваробы ці яе сімптомаў з мэтай увесці ў зман. Матывамі С. могуць быць дасягненне пэўных ільгот, ухіленне ад абавязкаў, імкненне пазбавіцца ад адказнасці за ўчыненае злачынства, прыцягнуць да сябе ўвагу і ў інш. Мэты С. могуць быць усвядомленыя (робіцца зацікаўленай асобай з пэўнай мэтай) і неўсвядомленыя (яе выпадкі назіраюцца, напр., у асоб з істэрычнымі неўрозамі, калі С. становіцца адным са спосабаў неадэкватнага вырашэння неўратычнага *канфлікту*). С. з мэтай ухілення ад прызыву на ваен. службу або ад яўкі на зборы праз прытворную хваробу крымінальнае заканадаўства Рэспублікі Беларусь разглядае як адну з прыкмет злачынства.

СІМФАНІ́ЗМ, метад муз. мыслення, які характарызуецца шматбаковым, філас.-абагульненым раскрыццём маст. канцэпцыі ў няўхільным руху, развіцці, узаемадзеянні муз. вобразаў.

Паняцце «С.» набыло пашырэнне пераважна ў сав. муз. навуцы і ў музыказнаўстве ўсх.-еўрап. краін. Уведзена Б.Асаф'евым як вызначэнне безупыннасці муз. свядомасці, калі ніводны элемент не мысліцца і не ўспрымаецца незалежным сярод астатніх. У станаўленні С. як гіст. катэгорыі асаблівае значэнне мае муз. мастацтва 18—19 ст., у якім, паводле Асаф'ева, адкрышталізавалася канфліктнае дыялектычнае развіццё («ідэя С.») і санатная форма («выразнік С.»). Эвалюцыя муз. мыслення ў 20 ст. абумовіла паглыбленне асаф'еўскай тэорыі С. У даследаваннях М.Араноўскага, Ю.Халопава і інш. найважнейшым крытэрыем С. вызначаецца прысутнасць развітога аўтаномна-муз. мыслення, якое рэалізуецца і за межамі дыялектычнай санатнай логікі ва ўмовах новага нетрадыц. муз. матэрыялу і прыёмаў яго развіцця (сімфоніі П.Булеза, С.Губайдулінай, В.Лютаслаўскага, А.Месіяна, К.Пендарэцкага, В.Сільвестрава, А.Шнітке і інш.).

У бел. музыцы асваенне метаду С. пачалося ў 19 ст. (сімф. уверцюры С.Манюшкі, канцэрты М.Ельскага). У 1920—30-я г. сфарміраваліся асн. тыпы нац. С.: жанрава-быт., гераіка-эпічны і драм. (М.Аладаў, В.Залатароў, Я.Цікоцкі, М.Чуркін); у 1940—50-я г. — далейшае паглыбленне і развіццё гэтых традыцый (Аладаў, А.Багатыроў, П.Падкавыраў, Р.Пукст). Пачатак 1960-х г. адзначаны сцвярджэннем востраканфліктных сімф. канцэпцый філас., лірыка-псіхал., драм. характару, пошукамі новых сродкаў выразнасці, пашырэннем сувязей з разнастайнымі з'явамі сучаснай муз. культуры. Навізной вобразнага зместу, муз. мовы, драматургіі і формы вылучаюцца сімфоніі Л.Абеліёвіча, Г.Вагнера, Я.Глебава, Дз.Смольскага. На мяжы 1980—90-х г. наглядаецца фарміраванне новых тэндэнцый нац. С., што выявілася ў пашырэнні семантычнага поля сімфоніі, актыўным сінтэзе жанраў, асіміляцыі прыкмет канцэртнай, камернай, кантатна-аратарыяльнай музыкі, звароце да новых сродкаў кампазіцыі, засваенні тэхнікі калажа і палістылістыкі (Смольскі, М.Мдывані, Ф.Пыталеў, Г.Гарэлава, У.Дамарацкі, У.Дарохін, В.Кузняцоў, А.Хадоска і інш.).

Літ.: Асафьев Б. (Игорь Глебов). Пути в будущее // Мелос. СПб., 1918. Вып. 2; Ярго ж. Симфонизм как проблема современного музыкознания // Беккер П. Симфония от Бетховена до Малера. Л., 1926; Ярго ж. Музыкальная форма как процесс. Кн. 1—2. 2 изд. Л., 1971; Дубкова Т.А. Беларуская сімфонія. Мн., 1974; Степанцевич К.И. О некоторых новых тенденциях в белорусском симфонизме 60-х — первой половины 70-х гг. // Вопросы музыкознания. Мн., 1981; Холопов Ю. О понятии «симфонизм» // Б.В.Асафьев и сов. музыкальная культура. М., 1986; Арановский М.Г. Симфонические искания. Л., 1979; Ярго ж. Симфония и Время // Русская музыка и XX в. М., 1997; Савицкая О.П. Вопросы становления и развития жанра симфонии в Беларуси // Науч. тр. Бел. гос. академии музыки. Мн., 2001. Вып. 6.

В.П.Савіцкая.

СІМФАНІ́ЧНАЯ КАРЦІ́НА, адначасткавы сімф. твор; адзін з жанраў *праграмнай музыкі*. Для С.к. характэрны карцінна-выяўл. тып праграмнасці, пазначанне аднаго, пераважна ўстойлівастатычнага, або некалькіх блізкіх па характары вобразаў. У параўнанні з *сімфанічнай паэмай* С.к. больш аднародная па вобразна-тэматычным складзе, драматургіі. С.к. ўводзіцца ў якасці самаст. нумару у оперы і балеты. Сярод бел. кампазітараў да С.к. звярталіся Л.Абеліёвіч («Накцюрн», «Танец»), А.Багатыроў («Бітва» ў оперы «У пушчах Палесся»), Я.Глебаў («Вясновая карцінка»), Р.Пукст («Сон» у оперы «Марынка»), Дз.Смольскі («Сімфанічная карціна»), К.Цесакоў («Тарас на Парнасе»), Л.Шлег («Несцерка»), Н.Усцінава («Беларускія карцінкі»), Л.Сімаковіч («Пачатак роду»), В.Іваноў («Сімфанічная карціна») і інш.

Літ.: Гл. да арт. *Праграмная музыка, Сімфанічная паэма.* *Т.А.Дубкова.*

СІМФАНІ́ЧНАЯ МУ́ЗЫКА, галіна *інструментальнай музыкі*, прызначаная для выканання *сімфанічным аркестрам*. Выразныя сродкі сімф. аркестра даюць магчымасць увасабляць разнастайныя творчыя задумы, складаныя драматург. канцэпцыі, значныя муз. вобразы як у манум. цыклічных кампазіцыях, так і ў невял. творах.

Вытокі С.м. ў інстр. ансамблевым музіцыраванні часоў антычнасці. У эпоху Адраджэння склаўся спецыфічны інстр. (ансамблева-аркестравы) стыль, у 17 — пач. 18 ст. сфарміраваліся жанры С.м.: *сюіта, канцэрт, уверцюра*. У выніку развіцця класічнага складу сімф. аркестра сталі фарміравацца *санатна-цыклічныя формы* і жанр *сімфоніі* ў творчасці кампазітараў *мангеймскай школы* і *венскай класічнай школы*, якая дала класічныя тыпы сімфоніі, канцэрта, уверцюры. У 19 ст. ўзніклі новыя жанры, удасканалены і інструменты сімф. аркестра, павялічылася роля дырыжора; паглыбіліся сувязі С.м. з опернай, балетнай, харавой, *камернай музыкай*.

Значнае месца ў С.м. займае *праграмная музыка* (сімфоніі, *сімфанічныя паэмы, сімфанічныя карціны, сімфанічныя фантазіі* і інш.). Да сімф. форм належаць таксама *сімфаньета, варыяцыі, рапсодыя, скерца, капрычыо*, уверцюра, легенда, *марш, папуры, танец* і інш. У канцэртны сімф. рэпертуар уваходзяць аркестравыя фрагменты з опер, балетаў, музыкі да драм. спектакляў, кінафільмаў і інш. У С.м. знайшлі ўвасабленне найб. значныя ідэі, тэмы і вобразы, разнастайныя маст.-эстэт. плыні (рамантызм, імпрэсіянізм, экспрэсіянізм і інш.), яскрава выявіліся асаблівасці нац. кампазітарскіх школ. Высокімі дасягненнямі адзначана рус. С.м. (М.Глінка, П.Чайкоўскі, М.Рымскі-Корсакаў, А.Глазуноў, С.Рахманінаў, А.Скрабін, І.Стравінскі, М.Мяскоўскі, Дз.Шастаковіч, С.Пракоф'еў і інш.).

На Беларусі С.м. — адна з вядучых галін прафес. кампазітарскай творчасці,

у якой адлюстраваны гісторыя народа, ідэі і вобразы сучаснасці, прыроды, нар. паданняў, казак, легенд і інш. Цікавасць да С.м. праявілася ў 1920-я г. (М.Аладаў, М.Чуркін, Я.Цікоцкі і інш.). Сярод жанраў бел. С.м.: сімфонія, сімф. паэма, сюіта, уверцюра, карціна, фантазія. Шырока прадстаўлены ў бел. С.м. прынцып праграмнасці.

Літ.: Бобровский В. Симфоническая музыка // Музыка XX в. М., 1976. Ч. 1, кн. 1; гл. таксама да арт. *Сімфанізм, Сімфонія.*

Т.А.Дубкова.

СІМФАНІ́ЧНАЯ ПАЭ́МА, адначасткавы праграмны сімф. твор, які ўвасабляе пэўны сюжэт ці філасофскую ідэю, вызначаныя ў літ. форме (праграме) ці ў назве твора; адзін з асн. жанраў *праграмнай музыкі*. Узнікла і фарміравалася ў 19 ст. ў непасрэднай сувязі з інш. блізкімі да яе жанрамі — праграмнай *уверцюрай, сімфанічнай карцінай, сімфанічнай фантазіяй*.

Звычайна С.п. складаецца з некалькіх эпізодаў, характар і паслядоўнасць якіх абумоўлены зместам праграмы, драматургіяй твора і падпарадкаваны эстэт. нормам формаўтварэння ў музыцы (гл. *Форма музычная*). У ёй свабодна выкарыстоўваюцца класічныя адна- і шматчасткавыя муз. формы, характэрна спалучэнне ў адзінай структуры рыс *санатнай формы* і санатна-сімф. цыкла, магчымы і нетыповыя структуры, спалучэнні рыс інш. муз. жанраў. Лепшыя С.п. створаны Ф.Лістам. Да С.п. звярталіся Б.Сметана, К.Сен-Санс, С.Франк, Р.Штраус, Я.Сібеліус, А.Дворжак, Б.Бартак, А.Шонберг, М.Рэгер, А.Рэспігі, М.Балакіраў, П.Чайкоўскі, М.Рымскі-Корсакаў, А.Скрабін, А.Глазуноў і інш.

У бел. музыцы тэматыка С.п. разнастайная: гіст. (В.Іваноў, У.Кандрусевіч), гераіка-патрыят. (М.Аладаў, У.Алоўнікаў, У. Дарохін, А.Мдывані, Ф.Пыталеў, Дз.Смольскі, Я.Цікоцкі). У некат. С.п. ўвасоблены філас. ідэі (А.Бандарэнка, Кандрусевіч, Н.Усцінава), сюжэты і вобразы маст. л-ры (С.Аксакаў, Г.Гарэлава, Я.Глебаў, Ю.Грыгор'еў, А.Клеванец, Л.Шлег і інш.), вобразы гіст. асоб (Аладаў). Значнае месца сярод С.п. займаюць творы, у якіх пераважае карцінна-выяўл. тып праграмнасці (Я.Дзягцярык, А.Залётнеў, А.Чыркун), а таксама святочныя С.п. (Глебаў, Мдывані, Л.Гуцін) і без абвешчанай праграмы (У.Дамарацкі, Дз.Даўгалёў, Э.Зарыцкі, Л.Захлеўны, А.Кочын, В.Помазаў, У.Прохараў, А.Сонін, І.Хадоска і інш.). Некат. творы тыпу С.п. маюць інш. вызначэнні, у т.л. сімф. балада, легенда (Глебаў), казка (В.Войцік), эскіз (Я.Паплаўскі) і інш.

Літ.: Попова Т.В. Симфоническая поэма. 3 изд. М., 1963. *Т.А.Дубкова.*

СІМФАНІ́ЧНАЯ ФАНТА́ЗІЯ, адначасткавы сімфанічны твор; адзін з жанраў *праграмнай музыкі*. Спалучае рысы *фантазіі* (свабода тэматычнага развіцця і будовы, часам са значнымі адхіленнямі ад традыц. тыпаў) і *сімфанічнай паэмы* (пераважаюць карцінна-выяўл. тып праграмнасці, элементы фантастыкі).

У замежнай музыцы прадстаўлена асобнымі ўзорамі («Дачка Поўначы» Я.Сібеліуса), шырока і рознабакова — у творчасці рус. кампазітараў П.Чайкоўскага, А.Глазунова, М.Мусаргскага, С.Рахманінава, І.Стравінскага і інш. Блізкія да С.ф. уверцюры-фантазіі Чайкоўскага, М.Глінкі. У рус. музыцы сфарміраваўся своеасаблівы від С.ф., заснаваны на свабодным сімф. развіцці фалькл. муз. тэм (фантазія «Камарынская» Глінкі на тэмы дзвюх рус. нар. песень, «Фантазія на сербскія тэмы» і «Іспанскае капрычыо» М.Рымскага-Корсакава, «Італьянскае капрычыо» Чайкоўскага, «Уверцюра на 3 рускія тэмы» М.Балакірава і інш.).

У творчасці бел. кампазітараў прадстаўлены традыцыйныя віды С.ф.: уверцюры-фантазіі «Зары насустрач», «Дума пра пагранічніка Лагоду» і капрычыо на тэмы бел. нар. песень М.Аладава, С.ф. Ю.Бяльзацкага, І.Лучанка, «Янка» П.Падкавырава, «Перапёлачка» Р.Пукста, «Свята» А.Мдывані і інш.

Літ.: Гл. да арт. *Праграмная музыка, Сімфанічная паэма.* *Т.А.Дубкова.*

СІМФАНІ́ЧНЫ АРКЕ́СТР, калектыў інструменталістаў, прызначаны для сумеснага выканання твораў *сімфанічнай музыкі*; вышэйшы тып аркестра.

Развіцце С.а. абумоўлена эвалюцыяй арк. інструментаў, новымі прыёмамі ігры, размяшчэннем музыкантаў на эстрадзе ці ў арк. яме, кіраваннем калектывам, зменай арк. мысленя кампазітараў. Класічны (т. зв. м а л ы) С.а. склаўся ў канцы 18 ст. Звычайна ў яго ўваходзілі квінтэт стр. смыкавых (1-я і 2-я скрыпкі, альты, віяланчэлі, кантрабасы), парны склад духавых (2 флейты, 2 габоі, 2 кларнеты, 2 фаготы, 2 валторны, пазней 2 трубы) і літаўры. У 19 ст. сфарміраваўся в я л і к і С.а., які ўключаў стр., парны склад драўляных з малой флейтай і контрафаготам, 4 валторны, 2 трубы, 3 трамбоны, тубу, літаўры, вугольнік, талеркі, вял. барабан. Творчасць рамантыкаў (К.М.Вебер, Ф.Шуберт, Ф.Мендэльсон, Г.Берліёз) стымулявала развіццё каларыстычных і драм. бакоў гучання, увод у С.а. інструментаў з асаблівым тэмбрам (малая, альтовая і басовая флейты, англ. ражок, габой д'амур, гекельфон, малы кларнет, басетгорн, бас-кларнет, саксафон, контрафагот, арфа, чэлеста, розныя ўдарныя інструменты). Творчасць Р. Вагнера абумовіла ўзнікненне трайнога, а да канца 19 ст. і чацвярнога (медная група ўзмоцнена квартэтам валторнавых, ці «вагнераўскіх», туб) складу С.а. Творчасць кампазітараў пач. 20 ст. (Р.Штраус, Г.Малер, А.Скрабін, І.Стравінскі) абумовіла з'яўленне з в ы ш а р к е с т р а ў з пяцярной групай духавых, павялічанай колькасцю стр., ударных і інш. інструментаў; колькасць выканаўцаў дасягала 100 і больш чалавек. У 20 ст. наглядалася тэндэнцыя да памяншэння арк. складаў. Сучасная практыка ўлічвае розныя арк. склады. Найб. пашыраны трайны, камерны (малы), С.а. з павялічанай групай ударных (Стравінскі, А.Шонберг, Б.Бартак, А.Месіян) без акрэсленай вышыні гучання. Адраджаюцца інстр. склады перыяду барока, вядзецца работа па стварэнні стэрэафанічнага гучання ў выніку індывідуалізаваных тыпаў рассаджвання музыкантаў або іх пераходу ў час выканання. З 1950-х г. пашырана «амерыканская рассадка»: злева ад дырыжора 1-я і 2-я скрыпкі, справа — альты і віяланчэлі, у глыбіні — драўляныя і медныя духавыя, кантрабасы, злева — ударныя інструменты. Сярод найб. вядомых С.а.: *Гевандхаўз* (1743), *Венскі філарманічны аркестр, Нью-Йоркі філарманічны аркестр* (абодва з 1842), *Бостанскі сімфанічны аркестр* (1881), *Берлінскі філарманічны аркестр* (1882), *Лонданскі філарманічны аркестр* (1932), *Дзяржаўны акадэмічны вялікі сімфанічны аркестр імя П.І.Чайкоўскага* (1930), *Маскоўскі дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр* (1943).

На Беларусі ў 18 — 1-й пал. 19 ст. дзейнічалі прыватна-ўладальніцкія муз. выканальніцкія калектывы пры дварах і т-рах магнатаў (Шклоў, Гродна, Слуцк, Нясвіж, Слонім; гл. *Прыгонныя аркестры і капэлы*). У 1803—1917 (з перапынкамі) працаваў *Мінскі гарадскі аркестр*; у канцы 19 ст. невял. прафес. С.а. існаваў у Віцебску, у пачатку 20 ст. дзейнічалі аматарскія С.а. ў Гродне (пры мужчынскай гімназіі), у Магілёве, С.а. у Брэсце (пры муз.-літ.-драм. гуртку). У 1910-я г. на базе нар. кансерваторый, муз. школ, драм. т-раў створаны С.а. ў Мінску, Віцебску, Гомелі, Магілёве. На Беларусі (2001) працуюць *Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь, Сімфанічны аркестр Беларускага тэлебачання і радыё*, Вял. сімф. аркестр творчага аб'яднання «Нац. акад. Вял. т-р оперы і балета Рэспублікі Беларусь», С.а. Дзярж. муз. т-ра Беларусі, *Дзяржаўны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь*, С.а. Гомельскай абл. філармоніі, С.а. ў Брэсце, Маладзечне і інш., вучэбныя С.а. сярэдніх спец. і вышэйшых навуч. устаноў, у т.л. «Маладая Беларусь» Бел. акадэміі музыкі і «Маладзёжны сімфанічны аркестр» Бел. ун-та культуры.

Літ.: Рогаль-Левицкий Д.Р. Беседы об оркестре. М., 1961; Благодатов Г.И. История симфонического оркестра. Л., 1969; Барсова И.А. Книга об оркестре. 2 изд. М., 1978. *Т.А.Шчарбакова.*


Сто год ад часу смерці 100
Людвіга ван-Бетховэна
(1827—1927 г.)
БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
У АЎТОРАК 29 САКАВІКА 1927 г.
прысвечаны творам Людвіга ван-Бэтховэна.
ВЯЛІКІ СЫМФОНІЧНЫ Концэрт
пад кіраўніцтвам дырыжора Беларускага Першага Дзяржаўнага Тэатру
Макса Купэра
пры ўдзеле
Артыстаў оперы В. М. Несьцярэнкі, Арт. Кошар. і-та Дзярж. тэатру М. М. Мартинай, С. А. Жыла, К. І. Мацюлевіча, В. А. Сэляха.
Пашыранае аркестры Дзяржаўнага Тэатру і Студыйнага Хору Гал.оўнае Управы Нацыянальнай Асьветы
1) Уверцюра „ЛЕОНОРА № 3", тв. 72 в) адна з чатырох уверцюр да оперы „ФІДЭЛІО".
2) З оперы „ФІДЭЛІО", тв. 72 ы), арыя Пізарро, выкон. В. А. СЭЛЯХ.
3. Концэрт для скрыпкі з аркестрай, D dur тв. 61, выкон. С. Л. ЖЫЛ.
I. Allegro ma non troppo. II. Larghetto. III. Rondo: Allegro
IV. Зоолярия „ФІДЭЛІО" тво. 72 ы) арыя Пізарро, выкон. В. М. НЕСЬЦЯРЭНКА
II. ДЗЕВЯТАЯ СЫМФОШЯ тв. 125.
выканаюць: аркестар, хор, В. М. НЕСЬЦЯРЭНКА, М. М. МАРТЫНАЙ, К. І. МАЦЮЛЕВІЧ і В. А. СЭЛЯХ.
I Allegro ma non troppo. ◆ II. Molto vivace ◆ III. Allegro
IV Finale: Presto — Allegro ma non troppo. Vivace. — Adagio cantabile — Allegro — Allegro assai

Канцэртная афіша **Сімфанічнага аркестра Беларускага дзяржаўнага тэатра першага**.

СІМФАНІ́ЧНЫ АРКЕ́СТР БЕЛАРУ́СКАГА ДЗЯРЖА́ЎНАГА ТЭА́ТРА ПЕ́РШАГА. Існаваў у 1920—28 у Мін-

ску пры БДТ-1. Аркестр узначальвалі дырыжоры В.Хаэнт, А.*Ягораў*, В.Субашэеў, М.Купер. У складзе аркестра каля 24 музыкантаў: І.Фідлон (канцэртмайстар), С.Жыў (пам. канцэртмайстра), М.Саламонаў, Л.Маркевіч (усе скрыпка), З.Гінзбург і А.Бародкін (2-я скрыпка), М.Гітліц і М.Голанд (альт), С.Фішкоў (віяланчэль), Я.Цымбал (кантрабас), *Я.Саламонаў (флейта), Г.Эльтэрман* і М.Бусловіч (кларнет), Б.Пагрибняк (габой), Б.Яўзераў (фагот), Я.Сцягенны і А.Буры (валторна), М.Фідлон (труба), Я.Штэйман (трамбон), У.Докун (ударныя), Я.Жыў і А.Ягораў (фп.), Я.Жыдовіч (цымбалы) і інш. Аркестр удзельнічаў у пастаноўках т-ра, у т.л. балетных «Фея лялек» І.Баера, «Зачараваны лес» Р.Дрыга (абедзве 1922), «Капелія» Л.Дэліба (1923) і оперных «Русалка» А.Даргамыжскага (1927) і інш. Штотыднёва ладзіў адкрытыя канцэрты сімф. музыкі. У канцэртным рэпертуары творы рус. і зах.-еўрап. класікі, у т.л. амаль усе сімфоніі Л.Бетховена. На базе аркестра створаны *Сімфанічны аркестр Белрадыёцэнтра.*

Літ.: Некрашэвіч А. Беларускі першы дзяржаўны тэатр, 1920—1930. Мн., 1930; Алексютович Л.К. Балетмейстер Константин Алексютович. Мн., 1984. *В.У.Мазанік.*

СІМФАНІ́ЧНЫ АРКЕ́СТР БЕЛАРУ́СКАГА ТЭЛЕБА́ЧАННЯ І РА́ДЫЁ, Сімфанічны аркестр Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь. Створаны ў 1958 як канцэртна-эстрадны, з 1975 эстр.-сімф., з 1979 сімф. аркестр, з 1958 гал. дырыжор Ю.*Бяльзацкі*, з 1961 — маст. кіраўнік і гал. дырыжор Б.*Райскі* (у 1965 дырыжор Я.*Глебаў*), з 1989 — засл. дз. маст. Украіны В.Лявонаў, з 1993 — А.*Лапуноў*. Напачатку аркестр выконваў пераважна творы лёгкай музыкі, з 1960-х г. гал. ўвагу аддаваў буйным сімф. творам. Калектыў прапагандуе музыку бел. кампазітараў. Здзейсніў фондавыя запісы опер бел. кампазітараў «Агатка, ці Прыезд пана» Я.Голанда, «Фауст» А.Радзівіла, «Кастусь Каліноўскі» Дз.Лукаса, «Андрэй Касценя» М.Аладава, «У пушчах Палесся» А.Багатырова, «Зорка Венера» Ю.Семянякі, «Сівая легенда» Дз.Смольскага, «Матухна Кураж» С.Картэса; радыёоперы «Барвовы золак» К.Цесакова; музыкі балетаў «Альпійская балада», «Выбранніца», «Маленькі прынц» Глебава, муз. камедый «Паўлінка» Семянякі і «Несцерка» Р.Суруса; сімфоній Л.Абеліёвіча, М.Аладава, *У.Алоўнікава, Глебава, Ф.Пыталева, Цесакова, а таксама творы* Г.Гарэлавай, Г.Ермачэнкава, А.Клеванца, В.Кузняцова, І.Лучанка, А.Хадоскі і інш. Запісаў шэраг твораў класічнага рэпертуару і сучасных кампазітараў. Першы выканаўца сюіты з балета «Маленькі прынц» і 5-й сімфоніі Глебава, фп. канцэрта Абеліёвіча, 3-й і 4-й сімфоній А.Мдывані, 2-й сімфоніі У.Дарохіна, сімфоніі-канцэрта «Каляды. Ражаство» Суруса, 4-й сімфоніі «Белая Русь» Хадоскі, скрыпічнага канцэрта Гарэлавай, кантаты «Трава-мурава» Л.Шлег і інш. Значнае месца займае канцэртная і гастрольная дзейнасць. Удзельнічае ў аўтарскіх канцэртах бел. кампазітараў. З аркестрам выступалі і рабілі запісы бел. і замежныя спевакі і інструменталісты.

Літ.: Мдзівані Т. Удзячнасць пошуку // Мастацтва Беларусі. 1983. № 5; Яе ж. Новые пути оркестра // Муз. жизнь. 1983. № 8; Друкт А. Сімфанічны аркестр Беларускага тэлебачання і радыё. Мн., 1984.

А.А.Друкт, В.У.Мазанік.

СІМФАНІ́ЧНЫ АРКЕ́СТР БЕЛРАДЫЁЦЭ́НТРА, Сімфанічны аркестр Белрадыёкамітэта. Існаваў у 1928—37 у Мінску. Створаны на аснове сімф. аркестраў БДТ-1 (гл. *Сімфанічны аркестр Беларускага дзяржаўнага тэатра першага*) і Бел. дзярж. муз. тэхнікума. У 1928 налічваў 50 чал. У розныя часы ў склад аркестра ўваходзілі музыканты С.Жыў (1-я скрыпка), Ю.Дрэйзін (2-я скрыпка), К.Бянеўскі (альт), М.Арлоў (віяланчэль), М.Славачэўскі (кантрабас), Б.Трызна (флейта), Б.Пагрибняк (габой), Г.Эльтэрман (кларнет), М.Пагрибняк (фагот), Я.Сцягенны (валторна), М.Штэйман (труба), І.Рыбкін (трамбон), М.Казакоў (туба), С.Маркоўскі (літаўры); дырыжоры А.*Бяссмертны*, І.*Гітгарц*, М.Міхайлаў (выпускнік Ленінградскай кансерваторыі па кл. Э.*Купера*), А.*Арлоў*, Л.*Штэйнберг*. Рэпертуар складалі творы кампазітараў розных эпох і кірункаў. Быў папулярызатарам бел. муз. мастацтва: праводзіў творчыя радыёвечары, справаздачныя канцэрты бел. кампазітараў. У яго выкананні гучалі творы М.Аладава, В.Залатарова, Р.Пукста, А.Туранкова, М.Чуркіна, А.Багатырова, М.Крошнера, *Р.Самохіна, П.Падкавырава. З 1937 у складзе Беларускай філармоніі.*

Літ.: Загородний Г.Н. Музыки высокое призвание. 2 изд. Мн., 1988; Яго ж. Белорусская государственная филармония. Мн., 1981. *В.У.Мазанік.*

СІМФАНЬЕ́ТА (італьян. sinfonietta памяншальнае ад sinfonia), шматчасткавы музычны твор, блізкі да *сімфоніі*. Ад апошняй адрозніваецца меншымі памерамі, абмежаваным складам выканаўцаў (пераважна малы сімф. ці камерны аркестр або інстр. ансамбль), прастатой муз. зместу (часта жанрава-быт. характару), змякчэннем канфліктнасці сімф. драматургіі.

Сфарміравалася ў 2-й пал. 19 ст. (І.Раф, М.Рымскі-Корсакаў). Найб. пашырылася ў 20 ст. ў творчасці М.Рэгера, П.Хіндэміта, Б.Брытэна, Ф.Пуленка, М.Мяскоўскага, С.Пракоф'ева, А.Хачатурана, Б.Чайкоўскага, М.Вайнберга, Г.Уствольскай і інш.

У бел. музыцы да С. ўпершыню звярнуўся М.Чуркін, аўтар 3 С. («Беларускія карцінкі», 1925; 1949,1955). Сярод інш. аўтараў С.: М.Аладаў, Г.Ермачэнкаў, П.Падкавыраў, Р.Сурус, К.Цесакоў і інш. *В.П.Савіцкая.*

СІМФЕРО́ПАЛЬ, горад, цэнтр Аўтаномнай Рэспублікі Крым, на Украіне, на р. Салгір. Засн. ў 1784. 339 тыс. ж. (1999). Чыг. станцыя. Тралейбусная сувязь з *Паўднёвым берагам Крыма*. Прам-сць: харчасмакавая (у т.л. парфумерна-касметычная, кансервавая, вінаробная, тытунёвая), лёгкая (трыкат., гарбарна-абутковая), маш.-буд. (абсталяванне для харч. прам-сці, тэлевізары), хімічная. 3 ВНУ, у т.л. ун-т. 3 тэатры. Музеі: маст., краязнаўчы.

Сімфанічны аркестр Беларускага тэлебачання і радыё. 1990-я г.

СІМФО́НІЯ (грэч. symphōnia сугучнасць ад syn разам + phōnē гук), музычны твор для *сімфанічнага аркестра*, напісаны ў *санатна-цыклічнай форме*. Звычайна складаецца з 4 кантрастных па характары частак. Часам С. пішуць для нетыповага складу выканаўцаў (камернага, стр., духавога аркестраў, аркестра нар. інструментаў або з далучэннем да аркестра хору, салістаў і інш.). С. ўласцівы значнасць зместу, які раскрываецца праз развіццё муз. вобразаў, іх суадносін і кантрастнасць тэматычнага матэрыялу частак, мае шырокія магчымасці ўвасаблення значных ідэй, складаных драматург. канцэпцый.

Тэрмін «С.» існаваў задоўга да ўзнікнення жанру. У Стараж. Грэцыі ён азначаў сугучнасць і сумесныя спевы ва унісон, у Стараж. Рыме — інстр. ансамбль, у эпоху Адраджэння — інстр. ўступы і эпізоды ў вял. вак. творах, пазней — асобныя вак. і інстр. кампазіцыі, у 17—18 ст. — уступную частку старадаўняй сюіты і аркестравы ўступ (уверцюру) да італьян. оперы. Трохчасткавая італьян. оперная С. (крайнія часткі хуткія, сярэдняя павольная) у 18 ст. адасобілася ад оперы і стала развівацца як самаст. канцэртны жанр, зазнаўшы ўплыў інш. арк. жанраў. Значная роля ў фарміраванні С. належыць кампазітарам *мангеймскай школы* і перадкласічнай венскай школы, а таксама Дж.Б.Самарціні (Італія), Ф.Гасеку (Францыя). Класічны тып С. і *сімфанізм* як прынцып муз. мыслення выкрышталізаваліся ў творчасці І.Гайдна і В.А.Моцарта, развіты Л.Бетховенам. У перыяд рамантызму ўзнікла і дасягнула росквіту праграмная С. (Г.Берліёз, Ф.Мендэльсон, Ф.Ліст). Сярод яе найб. значных зах.-еўрап. майстроў Ф.Шуберт, Р.Шуман, І.Брамс, А.Брукнер, Г.Малер, С.Франк, А.Дворжак, Я.Сібеліус, А.Анегер, П.Хіндэміт і інш. Рускі сімфанізм сфарміраваўся на нац. глебе і даў у розных жанравых адгалінаваннях С. (эпічная, жанравая, лірыка-драм.) яскравыя творы з шырокім эстэт. абагульненнем з'яў рэчаіснасці (П.Чайкоўскі, А.Барадзін, А.Глазуноў, С.Танееў, С.Рахманінаў, А.Скрабін, С.Пракоф'еў, Дз.Шастаковіч і інш.).

Першая бел. сімфонія належыць Я.Цікоцкаму (1927). Жанру С. аддавалі ўвагу амаль усе бел. кампазітары 20 ст. Найб. ўклад зрабілі Л.Абеліёвіч, М.Аладаў, Я.Глебаў, У.Дарохін, В.Кузняцоў, А.Мдывані, Р.Пукст, Ф.Пыталеў, Дз.Смольскі, Цікоцкі і інш. Развіваючы класічныя традыцыі і жанравыя тыпы, бел. кампазітары ўзбагацілі нац. муз. культуру змястоўнымі, высокамаст. С. Разнастайнасць яе тыпаў абумоўлена глыбінёй і абгрунтаванасцю драматург. канцэпцый, своеасаблівасцю стылістыкі, сувязей з фальклорам і інш. Значнае месца ў бел. музыцы займаюць праграмныя С. Аладава (5-я «Лірычная» сімфонія-балада «У суровыя дні»), В.Войціка («Каложа»), Глебава («Партызанская», «Да міру», «Альпійская сімфонія-балада»), Мдывані («Песні для аркестра», «Сімфонія ў стылі барока», «Памяць зямлі», «Полацкія пісьмёны», «Паўночныя кветкі»), Падкавырава («Юнацтва», «Мая Радзіма»), Ф.Пыталева («Памяць маці», «Чорная быль»), Дз.Смольскага (8-я С. з вершамі І.Бродскага), К.Цесакова («Памяці Веры Харужай»), Цікоцкага (5-я С. з часткамі «Стварэнне», «Чалавечнасць», «Жыццесцвярджэнне»). Аснова фарміравання характэрных нац. асаблівасцей бел. С. — фальклор у разнастайных аспектах яго творчага асэнсавання і ўвасаблення. У ёй прадстаўлены таксама асн. плыні сучаснай музыкі, што адбілася на вобразна-тэматычным ладзе, структурных і стыліст. асаблівасцях твораў. У структурных адносінах пераважаюць С. класічнай санатна-цыклічнай будовы, аднак намячаюцца тэндэнцыі да памяншэння колькасці частак цыкла, павелічэння і свабоднай кампазіцыі. Сярод С. у бел. музыцы: для камернага арк. (2-я Вагнера, 2-я У.Дарохіна, 1-я Залётнева, 3-я Цесакова, 2-я А.Клеванца і інш.), стр. арк. (4-я Глебава, 2-я А.Елісеенкава і інш.), арк. нар. інструментаў і хору (5-я С. «Памяць зямлі» Мдывані), твораў з хорам, інстр. ансамблем (2-я сімфонія Дарохіна), фп. і інш. інструментамі (3-я сімфонія Глебава, 1-я, 2-я, 3-я Залётнева, 9-я Смольскага і інш.), а таксама С. ў старадаўніх стылях («Сімфонія ў стылі барока» Мдывані). Найб. значныя С. ўвасабляюць глыбокія філас. канцэпцыі, з'яўляюцца спробай асэнсавання падзей мінулага і сучаснасці, выяўляюць істотныя рысы нац. культуры.

Літ.: Асафьев Б.В. Симфония // Очерки советского музыкального творчества. М.; Л., 1947. Т. 1; Соллертинский И.И. Музыкально-исторические этюды. Л., 1956; Арановский М.Г. Симфонические искания. Л., 1979; Беккер П. Симфония от Бетховена до Малера: Пер. с нем. Л., 1926; Гісторыя беларускай савецкай музыкі. Мн., 1971; Щербакова Т. О белорусской симфонической музыке // Музыкальная культура БССР. М., 1977; Дубкова Т.А. Беларуская сімфонія. Мн., 1974. *Т.А.Дубкова.*

СІМЯО́Н (864 ці 865 — 27.5.927), балгарскі князь (з 893), цар [з 919]. Прадоўжыў палітыку свайго бацькі — цара *Барыса I*, накіраваную на ўмацаванне і расшырэнне Балгарыі. Ваяваў з Візантыяй, вымусіў яе плаціць даніну, далучыў да Балгарыі частку Фракіі, Македонію, Албанію, сербскую вобласць Рашка і некат. харвацкія землі. На час праўлення С. прыпадае росквіт *Першага Балгарскага царства*, пачатак руху *багамілаў*.

СІМЯО́Н (н. 16.6.1937, Сафія), балгарскі дзярж. дзеяч. Сын балг. цара *Барыса III*. Пасля смерці бацькі цар Балгарыі [Сімяон II; 1943—46]. З абвяшчэннем Балгарыі рэспублікай (вер. 1946) эмігрыраваў (з 1951 жыў у Іспаніі). Працаваў кансультантам і чл. савета дырэктараў шэрагу ісп. кампаній. У 2001 вярнуўся ў Балгарыю, утварыў уласнае парт. аб'яднанне («царская кааліцыя»). Пасля перамогі сваёй кааліцыі на парламенцкіх выбарах 17.6.2001 (набрала 43% галасоў выбаршчыкаў) стаў прэм'ер-міністрам Балгарыі.

СІМЯО́Н ПО́ЛАЦКІ (сапр. Пятроўскі-Сітніянавіч Самуіл Емяльянавіч, паводле некат. звестак — Гаўрылавіч; 1629, г. Полацк Віцебскай вобл. —25.8.1680), бел. і рус. паэт, драматург, перакладчык, педагог, рэліг. і

Склад **Сімфанічнага аркестра Белрадыёцэнтра**. 1934.

грамадскі дзеяч. Скончыў Кіева-Магілянскі калегіум (каля 1650), вучыўся ў Віленскай езуіцкай акадэміі (да 1653). У 1654—64 настаўнік брацкай школы Полацкага Богаяўленскага манастыра. У 1656 прыняў манаства пад імем Сімяон. Прапагандаваў ідэю ўз'яднання хрысціян пад духоўнай эгідай рымскага папы і пад дзярж. патранатам маскоўскага цара. У полацкі перыяд творчасці пісаў на

Сімяон Полацкі.

бел., польскай, лац. мовах, раннія вершы («Акафіст», «Канон», 1648) маюць рэліг., павучальны характар, вытрыманы ў духу тагачаснай панегірычнай паэзіі. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 вітаў цара Аляксея Міхайлавіча ў Полацку дэкламацыяй «Метры», прысвяціў яму шэраг віншаванняў з выпадку ўзяцця пэўных гарадоў і інш.: «Вершы на шчаслівы зварот літасцівага цара з-пад Рыгі», «Віншаванне з выпадку ўзяцця Дэрпта», «Віншаванне з выпадку абрання на польскае каралеўства» і інш. Тады ж напісаў шэраг паліт.-сатырычных твораў, у якіх выкрываў захопніцкія войны швед. караля Карла X Густава: «Кароль шведскі шукае сваіх афіцэраў...», «Адчай шведскага караля...», а таксама іранічнае «Віншаванне... Амфінагену Крыжаноўскаму, вандруючаму псеўдаепіскапу». З 1664 жыў у Маскве. Арганізаваў «лацінскую» школу пры Заіконаспаскім манастыры, заснаваў незалежную ад патрыяршай цэнзуры Верхнюю друкарню, быў першым прыдворным паэтам рас. цароў, выхавацелем дзяцей Аляксея Міхайлавіча. Прыхільнік асветнага абсалютызму, быў у цэнтры дзярж. і рэліг. праблем Маскоўскай дзяржавы. Прапаведніцкая дзейнасць С.П. адлюстравана ў 2 зборніках яго пропаведзей: «Абед душэўны» (1675, выд. 1681) і «Вячэра душэўная» (1676, выд. 1683). Аснову яго літ. спадчыны складаюць 2 манументальныя зб-кі, падрыхтаваныя ў 1670-я г., але выдадзеныя пасмяротна: «Вертаград мнагацветны» і «Рыфмалагіён» (1678, выд. 1681). Яшчэ пры жыцці першы яго зборнік быў ацэнены як энцыклапедыя, з якой чэрпалі веды па хрысц. сімволіцы, гісторыі, ант. міфалогіі, тэалогіі. У другім зборніку змешчаны драм. творы «Камедыя прытчы пра блуднага сына...» і «Пра Навухаданосара цара...», якія ставіліся ў прыдворных тэатрах Крамля. Як перакладчык пазнаёміў чытачоў з многімі шырокавядомымі тагачаснымі творамі: «Казанне пра Магамета», «Тастамент, або Запавет Васіля, цара грэчаскага», «Гісторыя пра Варлаама і Іасафа» і інш. Значнае месца ў паэзіі С.П. займалі і сатыр. матывы, выкрыццё каставых заган, кар'ерызму, прыстасавальніцтва («Клятва», «Жонка», «Помста» і інш.). У многіх выказваннях С.П. прыкметны ўплыў натурфілас. поглядаў ант. аўтараў Арыстоцеля і Плінія, а таксама здабыткаў сярэдневяковай навукі. Панегірычны дух яго паэзіі выявіўся ў некат. структурных асаблівасцях сілабічных вершаў: ён звяртаўся да зрокава-графічных эфектаў і прыёмаў (каляровае пісьмо, новыя страфічныя формы і інш.), распрацоўваў чыста барочныя формы ўскладненых метафар, мудрагелістых алегорый, сімвалаў, гіпербал і інш. Паводле рашэння ЮНЕСКА імя С.П. было ўнесена ў каляндар памятных дат 1980.

Тв.: Избр. соч. М.; Л., 1953; У кн.: Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: Избр. произв. XVI — начала XIX в. Мн., 1962; У кн.: Русская силлабическая поэзия XVII—XVIII вв. Л., 1970; Вирши. Мн., 1990.

Літ.: Татарский И. Симеон Полоцкий: (Его жизнь и деятельность). М., 1886; Майков Л.Н. Симеон Полоцкий // Майков Л.Н. Очерки из истории русской литературы XVII и XVIII столетий. СПб., 1889; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Т. 1. Мн., 1968; История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977; Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд. Мн., 1985; Грынчык М.М. Шляхі беларускага вершаскладання. Мн., 1973; Панченко А.М. Русская стихотворная культура XVII в. Л., 1973; Конон В.М. От Ренессанса к классицизму. Мн., 1978; Мальдзіс А.І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980; Симеон Полоцкий и его книгоиздательская деятельность. М., 1982.

У.Г.Кароткі.

СІМЯО́НАЎ Канстанцін Арсенавіч (20.6.1910, с. Казнакова Старыцкага р-на Цвярской вобл., Расія — 3.1.1987), бел., укр. і рас. дырыжор. Нар. арт. СССР (1962). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1936). З 1918 вучыўся ў класах пры Ленінградскай акад. капэле імя М.І.Глінкі, спяваў у ёй, у 1928—31 дырыжор капэлы. З 1938 дырыжор Дзярж. акад. сімф. аркестра Беларусі, у 1939—41 маст. кіраўнік і дырыжор Дзярж. нар. аркестра Беларусі. З 1946 выступаў пераважна як сімф. дырыжор з вядучымі аркестрамі краіны. У 1961—66 і 1975—76 гал. дырыжор Кіеўскага т-ра оперы і балета імя Т.Р.Шаўчэнкі, у 1966—75 — Ленінградскага т-ра оперы і балета імя С.М.Кірава. Дзярж. прэмія Украіны імя Шаўчэнкі 1976.

Літ.: Григорьев Л.Г., Платек Я.М. Современные дирижеры. М., 1969.

Дз.М.Жураўлёў.

СІНАВІ́Т, запаленне сінавіяльнай абалонкі (слоя клетак і рыхлай валакністай злучальнай тканкі, што высцілае поласць сустава), якое суправаджаецца ўтварэннем і намнажэннем вадкасці (эксудату) у сумцы суставаў, сустаўнай поласці. Вылучаюць С. асептычныя (развіваюцца пры траўмах сустава, алергічных, метабалічных, эндакрынных парушэннях) і інфекц. (выклікаюцца стафілакокамі, стрэптакокамі, пнеўмакокамі, спірахетамі і інш.). Адрозніваюць серозныя, гемарагічныя, серозна-фібрынозныя і гнойныя С., таксама вострыя і хранічныя. Лячэнне тэрапеўт., хірургічнае.

А.С.Леанцюк.

СІНАВІЯ́ЛЬНАЯ ВА́ДКАСЦЬ (ад грэч. syn разам + лац. ovum яйцо), вязкая вадкасць, якую прадуцыруе сінавіяльная абалонка ў поласць сустава. Памяншае трэнне паверхні сустава пры руху, прадухіляе сустаўныя храсткі ад сцірання, выконвае таксама метабалічную і бар'ерную функцыі, у суставе яе ўтрымліваецца 1—2 мл. Паводле саставу — дыялізат плазмы крыві з уключэннем гіялуронавай кіслаты.

СІНАГО́ГА (ад грэч. synagōgē сход, месца сходу), бет-кнесет (іўрыт, літар. — дом сходу), шул (ідыш, літар. — школа), культавы будынак у *іудаізме*, прызначаны для набажэнстваў і рытуальнага чытання *Торы*. Часам тэрмін «С.» выкарыстоўваецца для абазначэння іудзейскай абшчыны.

Дакладны час узнікнення С. не высветлены. Паводле талмудычных крыніц, у 5 ст. да н.э. ў Палесціне легендарны іудзейскі святар Ездра з мэтай адраджэння нац. самасвядомасці яўр. народа ва ўмовах іншаземнага заваявання стварыў згуртаванне вучоных і знаўцаў нар. традыцый, якое атрымала назву Вял. С. Магчыма, у гэты час узніклі і збудаванні С. Патрэбнасць у С. звязана з усталяваннем традыцыі чытання *Пяцікніжжа* па суботах і святочных днях. Да пач. н.э. С. існавалі ва ўсіх рэгіёнах рассялення яўр. насельніцтва. Найб. іх

Сінагога ў г. Столін Брэсцкай вобл.

колькасць (480) знаходзілася ў Іерусаліме. Акрамя Палесціны С. будавалі ў г. Дамаску, Александрыі, Антыёхіі, Эфесе, Карынфе, Афінах, Рыме. Гал. месца ў С. займае святы каўчэг (арон-кадзеш), у якім захоўваюцца скруткі Торы (Сефер-Тора); ён знаходзіцца каля ўсх. сцяны. Вернікі моляцца на ўсх. напрамак С. (мізрах) — у бок *Іерусаліма*. Тора чытаецца са спец. ўзвышэння — бімы. У артадаксальных С. жанчынам адводзіцца асобнае месца (часта галерэя). Часам у С. і яе прыбудовах знаходзяцца

ўстановы, якія адыгрываюць важную ролю ў абшчынным жыцці: школы, дабрачынныя арг-цыі, рабінскі суд, зала сходаў і інш.

На фарміраванне арх. аблічча С. паўплывалі традыцыі і прыёмы культавага дойлідства Міжземнамор'я эпохі эліпізму і Рым. імперыі. Асновай першых будынкаў С. стаў базілікальны план, у аснове якога прасторнае памяшканне, падзеленае калонамі на падоўжныя нефы. З боку ўвахода і па баках рабілі порцікі з каланадай. Гал. (алтарная) сцяна арыентавалася на Іерусалім (у еўрап., у т.л. бел., яўрэяў на У), каля яе невял. ўзвышэнне (альмэ-мор). У цэнтры залы — кафедра (біма). У некат. С. меўся арган. Алтары багата ўпрыгожвалі разьбяным арнаментам, узорамі маст. кавальства і ліцця з расл. і зааморфнымі матывамі. Па меры рассялення яўрэяў па краінах Еўропы, С. набывалі стылёвыя рысы пэўных народаў і эпох.

На бел. землях С. з'явіліся ў 14 ст. Будавалі С. драўляныя і мураваныя. Архітэктура бел. С. ўвасабляе стылізаваны і пераасэнсаваны вобраз жытла, каўчэга. Усе С. складаюцца з цэласнага, значных памераў аб'ёму пад дахам, блізкім да шатровага (у гарадах Ашмяны Гродзенскай, Столін Брэсцкай абласцей, 18 ст.). *Слонімская сінагога* арганічна ўпісалася ў гар. арх. ансамбль стылю барока. Архітэктура некат. мураваных С. з рысамі абарончага дойлідства (*Быхаўская сінагога*). С. ў г. Іўе (Гродзенская вобл.) эклектычная, складаецца з 3 будынкаў для розных слаёў насельніцтва — гандляроў, рамеснікаў і купцоў. Найб. арыгінальныя драўляныя С., якім уласціва адзінства вобраза, аб'ёмна-прасторавае вырашэнне, у аснове якога — пераход рытуальнага памяшкання ў шатровы, часта складанай формы, дах. Формы абыходных галерэй, прыбудоў паўтараюць у мініяцюры форму асн. аб'ёму (С. ў Заблудаве, цяпер Падляскае ваяв., Польшча; не захаваўся). С. былі ў гарадах Гродна, Глыбокае, Нароўля, г.п. Сапоцкін, в. Воўпа Ваўкавыскага р-на і інш. Да 1917 ва ўсх. Беларусі былі 704 С. У сувязі з антырэліг. дзейнасцю сав. улад у 1936 засталася 71 С. Шмат С. знішчана ням.-фаш. акупантамі ў Вял. Айч. вайну. У пач. 1990-х г. на Беларусі дзейнічалі 2 С., на 1.1.2001 — 8 С. *А.І.Лакотка*

СІНАДЫ́ЧНЫ МЕ́СЯЦ (ад грэч. synodos збліжэнне, злучэнне), прамежак часу паміж двумя паслядоўнымі аднолькавымі *фазамі Месяца* (напр., маладзікамі). Працягласць С.м. непастаянная; сярэдняе значэнне складае 29,530583 сярэдніх сонечных сутак, адхіленне — у межах 13 гадз. З'яўляецца асновай месяцавых *календароў*.

СІНАДЫ́ЧНЫ ПЕРЫ́ЯД АБАРАЧЭ́ННЯ, прамежак часу, за які цела Сонечнай сістэмы ў сваім руху вакол Сонца вяртаецца пры назіранні з Зямлі ў ранейшае становішча адносна Сонца. Роўны перыяду паўтарэння *канфігурацыі планет*.

СІНАЙКІ́ЗМ (грэч. synoikismos ад synoikizō разам засяляю), у старажытных дзяржавах (Грэцыі, Рыме і інш.) працэс зліцця некалькіх раней самастойных паселішчаў ці гарадоў у адзіны *паліс*. У выніку С. паступова ліквідавалася племянная раздробленасць, узнікалі органы цэнтр. кіравання, узмацнялася эканам. адзінства і ваен. магутнасць раней адасобленых плямён і абшчын. Найб. вядомы С. 12 абшчын Атыкі, якія аб'ядналіся пад уладай *Афін* (13—7 ст. да н.э.). У выніку С. плямён *лаціна*ў, *сабіна*ў і *этрускаў* узнік Стараж. Рым (6 ст. да н.э.).

СІНАЙКІ́Я (ад грэч. synoikia сумеснае жыццё, жыллё), сумеснае жыццё жывёл (арганізмаў) розных відаў, калі абодва партнёры ў рознай ступені індыферэнтныя адзін да аднаго або адзін з іх атрымлівае для сябе карысць і не прычыняе шкоды другому; адна з катэгорый *кватаранцтва*.

СІНА́ЙСКАЕ ПІСЬМО́, протасінайскае пісьмо, старажытная пісьмовая сістэма семіцкіх народаў. Адна з першых у гісторыі цывілізацыі спроб стварэння алфавітнай пісьменнасці на падставе акрафаніі (вымаўленне пачатковай фанемы слова, якое перадаецца малюнкам). С.п. лічаць прамежкавай ступенню паміж егіпецкім іерагліфічным пісьмом і семіцкімі кансанантна-гукавымі алфавітамі. Помнікі С.п. (надпісы на камянях, статуэтках багінь) знойдзены ў 1905 на Сінайскім п-ве англ. археолагам У.М.Пітры. Датаванне помнікаў да гэтага часу спрэчная (ад 18 да 15 ст. да н.э.). Найб. удалая спроба прачытання (дэшыфроўкі) помнікаў належыць У.Ф.Олбрайту ў сярэдзіне 20 ст. Некат. даследчыкі лічаць С.п. крыніцай *арабскага пісьма*.

Літ.: Павленко Н.А. Истории письма. 2 изд. Мн., 1987. *А.Я.Міхневіч.*



Слова 'rth «Цяліца» ў **сінайскім пісьме**.

СІНА́ЙСКІ Васіль Серафімавіч (н. 20.4.1947, пас. Абезь, Рэспубліка Комі), дырыжор. Нар. арт. Латвіі (1981). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1970). З 1971 2-і дырыжор сімф. аркестра ў Новасібірску. З 1975 маст. кіраўнік і гал. дырыжор Дзярж. сімф. аркестра Латвіі, з 1989 Дзярж. малога сімф. аркестра СССР. З 1976 выкладае ў Латвійскай кансерваторыі.

СІНА́ЙСКІ ПАЎВО́СТРАЎ. На З Азіі, паміж зал. Суэцкім і Акаба Чырвонага м.; тэр. Егіпта. Пл. каля 25 тыс. км². На Пд горы, складзеныя з гранітаў, гнейсаў, крышт. сланцаў (выш. да 2637 м, г. Катэрын — вышэйшы пункт Егіпта). На Пн паверхня зніжаецца да 500—1000 м. Пераважаюць моцна расчлянёныя камяністыя плато Эгма і Эт-Тых і пласкагор'і. Уздоўж Суэцкага зал. — вузкая пясчаная нізіна. Паўпустыні і пустыні. Радовішчы нафты (Судр, Абу-Рудайс, Эт-Тур), марганцавай руды (Ум-Бугма). Клімат пераходны ад субтрапічнага да трапічнага, гарачы, сухі. Ападкаў менш за 50 мм за год. Густая сетка вадзі. Расліннасць разрэджаная пустынная (паўхмызняковая і травяністая). Па сухіх рэчышчах калючыя хмызнякі і асобныя дрэвы. Качавая жывёлагадоўля, аазіснае земляробства (вырошчванне фінікавай пальмы, ячменю, проса, кукурузы). На С.п. знаходзіцца манастыр св. Кацярыны — помнік архітэктуры і мастацтва, засн. ў 4 ст. (найбагацейшы збор твораў візант. мастацтва, сярэдневяковыя рукапісы, хрысц. абразы 6 ст. ў тэхніцы васковага жывапісу).

СІНАЛО́ГІЯ (ад позналац. Sina Кітай + ... *логія*), кітаязнаўства, сукупнасць грамадскіх навук, якія вывучаюць гісторыю, філасофію, эканоміку, мовы, л-ру і культуру Кітая. Ужываецца як паняцце па-за межамі гэтай краіны. Першыя звесткі пра Кітай еўрапейцы атрымалі ў канцы 13 ст. з нататак Марка *Пола*. Да сярэдзіны 19 ст. ў Еўропе працягвалася назапашванне навук. звестак пра Кітай. У канцы 16—18 ст. ўклад у С. зрабілі каталіцкія місіянеры-езуіты, у т.л. М.Рычы, які першы з еўрапейцаў азнаёміўся з кіт. класічнымі літ. помнікамі. Важнае значэнне мелі нататкі рас. пасланніка ў Пекіне ў 1655—57 Ф.І.*Байкова*, даследаванні супрацоўнікаў Рас. духоўнай місіі ў Пекіне (1727—1866), у іх ліку М.Я.*Бічурына*, П.І.*Кафарава*, ураджэнцаў Беларусі І.А.*Гашкевіча* і А.М.Кульчыцкага. Пашырэнне кантактаў Кітая з зах. светам пасля паражэнняў у т.зв. опіумных войнах 1840—42 (з Вялікабрытаніяй) і 1856—60 (з Вялікабрытаніяй і Францыяй) стымулявала рост цікавасці да яго ў Еўропе і станаўленне С. як навукі. У канцы 19 ст. англ. вучоны Дж.Лег пераклаў усе кананічныя кнігі *канфуцыянства* і *даасізму* з каментарыямі. У 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. склаліся ням.-галандская, франц. і англ. школы С. Іх найб. выдатныя прадстаўнікі: немцы В.Грубе (кіт. звычаі, абрады) і О.Франке (гісторыя канфуцыянства, ідэалогія імператарскага Кітая), нідэрландзец Я.Я. дэ Гроат (рэлігія, гісторыя і культура Кітая, 6-томная праца «Рэлігіі Кітая»); французы Э.Шаван (канфуцыянства, даасізм, будызм), П.Пельё (кіт.-будысцкая традыцыя), А.*Масперо* (кіт. міфалогія); англічане Г.А.Джайлс (л-ра і

філасофія) і А.Уэйлі (маст. культура). У 1930—50-я г. ўзнікла гіст. фаналогія кіт. мовы (Б.Карлгрэн, Швецыя), з'явіліся працы па кіт. простанар. вераваннях і абрадах (Э.Эбергард, Германія), філасофіі даасізму і канфуцыянства гісторыі Стараж. Кітая (Э.Грэм і Х.Х.Дабс, Вялікабрытанія), гісторыі кіт. грамадскай думкі (Э.Балаш, Францыя—Германія), філасофіі і міфалогіі (Д.Бодэ, ЗША). З сярэдзіны 20 ст. ў самаст. навук. дысцыпліны вылучыліся даалогія (вывучэнне даасізму; А.К.Зайдэль, Г.Крыл, Н.Сівін, К.М.Скіпер), сіна-будалогія (вывучэнне будызму; Э.Цюрхер, Р.Х.Робінсан, К.Чэнь), вывучэнне гісторыі і культуры Стараж. Кітая (Д.Н.Кітлі, М.Лёве, Дж.Мейджар, К.Чан), гісторыя літ.-тэарэт. і маст.-эстэт. думкі ў Кітаі (Дж.Лю, А.Райт, Ф.Такеі). Заснавальнік С. ў Расіі — В.П.*Васільеў*, арганізатар і першы кіраўнік кафедры кіт. мовы ў Пецярб. ун-це (1855). Яго паслядоўнік С.М.Георгіеўскі (1851—93) — спецыяліст у галіне міфалогіі і традыц. культуры Кітая. У сав. час пытанні С. распрацоўвалі В.М.Аляксееў, Ю.К.Шуцкі, А.А.Штукін, М.І.Конрад, Л.Дз.Пазднеева, В.Л.Фішман, у 1990-я г. — Л.С.Васільеў, Ю.Л.Кроль, У.В.Малявін, Л.С.Пераломаў, М.Я.Краўцова і інш. У Рэспубліцы Беларусь філалагічнай С. займаецца А.М.Гардзей. *В.У.Адзярыха.*

СІНАНІМІЯ (ад грэч. synōnymia аднайменнасць), поўнае ці частковае супадзенне значэнняў моўных адзінак. Сінанімічнымі могуць быць словы, фразеалагізмы, марфемы, словаўтваральныя мадэлі, сінтаксічныя канструкцыі. Лексічныя сінонімы — словы і выразы, што аб'ядноўваюцца ў групы (сінанімічныя рады) на аснове блізкасці значэння. Сярод іх вылучаюць сінонімы семантычныя, стылістычныя, семантыка-стылістычныя, абсалютныя. У сучаснай бел. літ. мове найб. семантыка-стылістычных сінонімаў, абсалютныя сінонімы адзінкавыя. Семантычныя сінонімы (звычайна нейтральныя словы і выразы) ажыццяўляюць камунікатыўную функцыю мовы, што выяўляецца ў дыферэнцыяцыі адценняў значэння, дэталізацыі, выдзяленні і актуалізацыі паняцця («Сланечнікі ў гародчыку апусцілі прывялае лісце, схавалася **ў засень, у цень** усё жывое...». І.Навуменка). Стылістычныя сінонімы ажыццяўляюць эстэт. функцыю мовы, што выражаецца ў эмацыянальна-экспрэсіўнай характарыстыцы слова, выразу («І якраз у той момант, калі я зразумеў, што тут, пэўна, давядзецца і начаваць, калі ўжо такім **далёкім і нядасягальным** здаўся мне цягнік, якім сёння ноччу я думаў ехаць, пачуўся далёкі прыглушаны бас машыны». Я.Сіпакоў). Семантыка-стылістычныя сінонімы адрозніваюцца адначасова сэнсам і стылістычнай афарбоўкай («Не раз я за мурам астрожным па родных гонях **сумаваў**. Адны любяць пад песню схіліць галаву, **зажурыцца**, як неба ўвосень. Ну, засні, і не варта **тужыць**. Вось ты тут **сохнеш** за астрожным мурам». М.Танк). Абсалютныя сінонімы — тэрміналагічныя словы-дублеты, якія адрозніваюцца толькі паходжаннем (бел. «назыўны», «правапіс» і запазычаныя «намінатыўны», «арфаграфія»). Кантэкстуальныя (сітуацыйныя, аўтарскія, аказіянальныя) сінонімы — словы і выразы, якія суадносяцца з пэўным агульным аб'ектам рэчаіснасці (рэаліяй) толькі ў адпаведным кантэксце, выражаюць адно паняцце метафарычна-вобразна і ўтвараюць семантыка-стылістычную групу, блізкую да сінанімічнага рада («А сын жа мой яшчэ **малы**. Зусім яшчэ **маладзенькі** мой Данілка. Ён жа яшчэ **не поўня**, а **паўмесячык**. **Маладзічок**». А.Бялевіч). Марфалагічныя сінонімы — сінанімічныя формы слоў («жыццядайнай сілы — жыццядайнае сілы», «самы дарагі — найдаражэйшы»). Сінтаксічныя сінонімы — канструкцыі, аднародныя са структурна-сэнсавага і функцыянальнага пункту погляду, але адметныя семантычнымі адценнямі (у межах агульнага іх значэння) і стылістычнай афарбоўкай («пайсці да рэчкі — пайсці пад рэчку, пайсці ў бок рэчкі, пайсці ў напрамку рэчкі»). Развітасць сінанімікі (сукупнасці сінонімаў ў мове) — паказчык дакладнасці, вобразнасці, багацця мовы.

Літ.: Цікоцкі М.Я. Стылістыка беларускай мовы. Мн., 1976; Каўрус А.А. Стылістыка беларускай мовы. 3 выд. Мн., 1992; Яўневіч М.С. Сінтаксічная сінанімікa ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. Мн., 1977; Беларуская мова. Мн., 1991; Юрэвіч А.К. Стылістыка беларускай мовы. 2 выд. Мн., 1992. *А.К.Юрэвіч.*

СІНА́НТРАП (ад позналац. Sina Кітай + грэч. anthrōpos чалавек), прадстаўнік найстаражытнейшых выкапнёвых людзей (гл. *Архантрапы*), рэшткі касцей якога знойдзены ў 1927 у кар'еры Чжаўкаўдзянь (45 км на ПнЗ ад г. Пекін). У параўнанні з *пітэкантрапам* С. меў больш высокія лоб і скляпенне чэрапа (аб'ём 1040 см^3). У 1933 выкапнёвыя рэшткі чалавека і 3 чарапы, якія добра захаваліся, выяўлены ў т.зв. Верхняй пячоры. Побач знойдзены ўпрыгожанні са свідраваных зубоў жывёл, ракавін і каменю. Гэтыя рэшткі належаць чалавеку сучаснага тыпу. У 1963 у пав. Ланцьян (правінцыя Шэньсі) знойдзена ніжняя сківіца, паводле якой вылуча-

Сінан. Мячэць Сулеймана I у Стамбуле.

Сінантрап. Рэканструкцыя.

СІНА́Н, Каджа Мімар Сінан (1489 ці 1490, г. Кайсеры, Турцыя — 1588), турэцкі архітэктар і інжынер. З 1538 гал. архітэктар султана Сулеймана I Кануні. Творча пераасэнсоўваў канстр.-маст. вопыт візант. дойлідства. Узводзіў велічныя цэнтрычныя купальныя мячэці з інтэр'ерамі, аздобленымі керамічнымі пліткамі (Шахзадэ, 1548, Сулеймана I, 1550—57, у г. Стамбул; Джума-Джамі, 1552, у г. Еўпаторыя, Рэспубліка Крым, і інш.), маўзалеі, палацы, масты, умацаванні.

юць больш стараж. від С. — ланцьянскі. Узрост большасці знаходак 460—230 тыс. гадоў.

СІНАНТРО́ПНЫЯ ВІ́ДЫ, сінантропы (ад грэч. syn разам + anthrōpos чалавек), жывыя арганізмы, прыстасаваныя да існавання ва ўмовах, створаных або зменены чалавекам. Сярод жывёльных С.в. вылучаюцца аблігатныя, ці абавязковыя С.в. (напр., хатняя мыш, пацукі, пасцельныя клапы, тараканы), якія цесна звязаны з чалавекам і па-за межамі яго паселішчаў не сустракаюцца; факультатыўныя, ці магчымыя С.в. (напр., звычайная палёўка, некат. дробныя драпежнікі, вераб'іныя і курыныя птушкі), якія менш звязаны з чалавекам, пазбягаюць населеных пунктаў і жывуць на пасевах, у пасадках і інш. Інтэнсіўная урбанізацыя, развіццё трансп. сувязей садзейнічаюць пашырэнню арэалаў і колькасці відаў С.в., многія з якіх сталі *касмапалітамі*. Сярод С.в. шмат жывёл-шкоднікаў, што абумоўлівае неабходнасць барацьбы з імі. Да раслін-сінантропаў належыць *пустазелле*.

СІНА́П АРЛО́ЎСКІ, позназімовы сорт яблыні. Выведзены ва Усерас. НДІ селекцыі пладовых культур скрыжаваннем сартоў Сінап паўночны і Памяць Мічурына. На Беларусі ўключаны ў Дзярж. рэестр для выкарыстання ў вытв-сці паўсюдна.

Дрэва буйнарослае, з круглаватай кронай сярэдняй гушчыні. Сорт ураджайны, сярэднеўстойлівы да грыбных хвароб. Плады вышэй сярэдняй велічыні (каля 150 г), круглавата-канічнай формы. Скурка зялёна-жоўтая, ярка-чырв. з сонечнага боку. Мякаць зеленаватая, сакавітая, прыемнага кісла-салодкага смаку. Збор пладоў у вер.; захоўваецца да красавіка. *З.А.Казлоўская.*

СІНАПСІ́ДЫ, падклас вымерлых паўзуноў, гл. *Звярападобныя*.

СІ́НАПСЫ (ад грэч. synapsis злучэнне, сувязь), функцыянальныя кантакты паміж узбудлівымі клеткамі (нерв., мышачнымі, сакраторнымі), якія пераўтвараюць і перадаюць нерв. імпульсы. Тэрмін «С.» ўведзены Ч.С.*Шэрынгтанам* (1897). С. — найб. істотны структурна-функцыян. элемент мозга, а сінаптычныя сувязі — гал. механізм міжнейроннага ўзаемадзеяння, які забяспечвае асн. праяўленні дзейнасці нерв. сістэмы. Колькасць С. на паверхні нейрона ад 1 да 20 тыс. У С. адрозніваюць прэсінаптычную ч. (звычайна канец прэсінаптычнага аксона), сінаптычную шчыліну (прастора, якая раздзяляе мембраны клетак, што кантактуюць, шыр. 20—30 нм) і постсінаптычную ч. (участак клеткі, да якога падыходзіць прэсінаптычны канец). Па функц. значэнні С. бываюць узбудлівыя і тармазныя ў адпаведнасці з тым, актывуюць яны або прыгнечваюць адпаведныя клеткі. Перадача сігнала праз С. адбываецца ў імпульснай (дыскрэтнай) форме ў адзін бок з дапамогай хім. або эл. механізма. Змешаныя С. спалучаюць хім. і эл. механізмы перадачы. У найб. пашыраных хім. С. перадача нерв. імпульсу адбываецца з дапамогай хім. рэчыва — *медыятара*. *А.С.Леанцюк.*

СІНАПТАЗА́ЎРЫ (Synaptosauria, або Euryapsida), падклас вымерлых паўзуноў. 2 атр. — заўраптэрыгіі і плакадонты. Вядомы з пермскага перыяду да позняга мелавога перыяду. Былі пашыраны ў морах усіх мацерыкоў (акрамя Антарктыды).

Даўж. ад 20 см да 15 м. Экалагічна і марфалагічна разнастайныя. У большасці чэрап падоўжаны, вачніцы размешчаны амаль пасярэдзіне, цемянная адтуліна звычайна захоўвалася. Канечнасці ластападобныя, характэрна адно скроневае акно. Карміліся рыбай і малюскамі.

СІНАПТЫ́ЧНАЯ МЕТЭАРАЛО́ГІЯ, раздзел *метэаралогіі*, які вывучае атмасферныя працэсы, што вызначаюць умовы *надвор'я*, а таксама іх змены для распрацоўкі *прагнозу надвор'я*. Даследуе буйнамаштабныя атм. працэсы (узнікненне і перамяшчэнне *цыклонаў* і *антыцыклонаў*, *паветраных мас* і *франтоў атмасферных*), якія ахопліваюць па гарызанталі сотні і тысячы кіламетраў. Аналіз атм. працэсаў праводзіцца пры дапамозе *сінаптычных карт*, верт. разрэзаў атмасферы, аэралагічных дыяграм. У сінаптычным аналізе выкарыстоўваюцца таксама фотаздымкі воблакаў з *метэаралагічных спадарожнікаў*, матэрыялы назіранняў за воблакамі, ападкамі і інш. атм. з'явамі пры дапамозе метэаралагічных радыёлакатараў. На падставе заканамернасцей, якія выяўляюцца пры вывучэнні матэрыялаў, скарыстання лічбавых метадаў прагнозу і рашэння ўраўненняў гідра- і тэрмадынамікі пры дапамозе ЭВМ, распрацоўваюцца прагнозы надвор'я.

СІНАПТЫ́ЧНЫЯ КА́РТЫ, карты надвор'я, геаграфічныя карты, на якія лічбамі і ўмоўнымі знакамі наносяць вынікі адначасовых назіранняў за надвор'ем, а таксама даныя сінаптычнага *аналізу*. *Адрозніваюць С.к. прыземныя (складаюцца паводле наземных сінаптычных назіранняў)* і *вышынныя* (паводле аэралагічных назіранняў у атмасферы); складаюцца таксама прагнозныя С.к., якія адлюстроўваюць магчымае поле ціску, т-ры, ападкі і інш. з'явы надвор'я на вызначаны тэрмін. На С.к. праводзяць *ізабары*, пазначаюць размяшчэнне цыклонаў і антыцыклонаў, атмасферных франтоў, зоны ападкаў, туманаў і інш. З дапамогай С.к. праводзяцца даследаванні атмасферных працэсаў (сінаптычны аналіз) і *прагноз надвор'я*. Гл. таксама *Сінаптычная метэаралогія*.

СІНА́ТРА (Sinatra) Фрэнк, сапр. імя Фрэнсіс Альберт; 12.12.1915, г. Хобакен, штат Нью-Джэрсі, ЗША — 1998), амерыканскі эстрадны спявак, кінаакцёр. У 1936 узначаліў створаны ім вак. ансамбль «Хобакенская чацвёрка». З 1939 саліст джазавага аркестра Х.Джэймса, аркестра пад кіраўніцтвам Т.Дорсі. У 1940—70-я г. выступаў з буйнымі амер. джазавымі аркестрамі, у т.л. пад кіраўніцтвам Дз.Элінгтана. Яго выканальніцкі стыль разнастайны: ад інтымнай манеры «крулінг» да «свінга». У рэпертуары сентыментальныя балады, песні з мюзіклаў, папулярныя песні амер. кампазітараў Дж.Стайна, Б.Бакрака, Р.Мак-Кэна і інш. З 1941 здымаўся ў кіно (больш за 40 фільмаў), у т.л. «Ночы Лас-Вегаса», «Дом, у якім я жыву», «Ад сёння і на векі вечныя» (абодва прэмія «Оскар»), «Чалавек з залатой рукой», «Дэтэктыў», «Першы смяротны грэх». Рэжысёр фільма «Толькі храбрэц» (1964). Меў уласную грамафонную кампанію. Спец. прэмія «Оскар» 1971.

СІ́НА-ТЫБЕ́ЦКІЯ ГО́РЫ, Сычуаньскія Альпы, Хуандуаньшань, у Кітаі. Даўж. каля 750 км, шыр. да 400 км. Выш. ад 5000—6500 м на З да 1000—1200 м на У, найб. выш. 7590 м (г. Гунгашань). Утвараюць усх. ўступ Тыбецкага нагор'я, на мяжы з раўнінамі і нізкагор'ямі Усх. Кітая, з'яўляюцца мяжой Сычуаньскай катлавіны. Падзяляюцца на шэраг субмерыдыянальных хрыбтоў, парэзаных глыбокімі падоўжнымі цяснінамі рэк Салуін, Меконг, Янцзы ў іх верхніх цячэннях (глыб. ўрэзу да 3000 м). Хрыбты пераважна стромкасхілыя, з рэзкімі скалістымі водападзельнымі грабянямі. Горы — частка стараж. платформы, якая актывізавалася мезазойскімі рухамі; расчлянёна разломамі на шэраг блокаў, складзеных з гнейсаў, крышт. сланцаў, пясчанікаў, вапнякоў. Перыферыйныя грады, якія далучаюцца да Сычуаньскай катлавіны, складзены з базальтаў і асадкавых тоўшчаў. Горы сейсмічныя. Радовішчы жал. руды, золата, медзі. Ледавікі. Субтрапічны клімат зах. ускраіны Сычуаньскай катлавіны з вышынёй рэзка пераходзіць да кантынент. клімату Тыбецкага нагор'я. *Каля паўд. падножжаў гор — 1200 мм ападкаў (максімум летам), на наветраных схілах — больш за* 2000 мм, па меры набліжэння да Тыбецкага нагор'я — да 600 мм за год. Да выш. 2000 м субтрапічныя вечназялёныя лясы з эндэмікамі, якія з вышынёй пераходзяць у мяшаныя лясы; у адкрытых на Пд далінах трапляецца ціс. На выш. 2000—4000 м пераважаюць хвойныя (гал. ч. піхтавыя, радзей яловыя) лясы, вышэй за 4000 м размешчаны альпійскія лугі і стэпы.

СІ́НА-ТЫБЕ́ЦКІЯ МО́ВЫ, гл. *Кітайска-тыбецкія мовы*.

СІНГ (Synge) Рычард Лоўрэнс Мілінгтан (28.10.1914, г. Ліверпул, Вялікабрытанія — 1994), англійскі біяхімік, адзін з заснавальнікаў аналіт. хіміі бялкоў. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1950). Скончыў Кембрыджскі ун-т (1936). З 1941 у Асацыяцыі шарсцяной прам-сці, з 1943 у Лістэраўскім ін-це ў Лондане, з 1948 — у Роўэцкім даслед-

чым ін-це ў г. Абердзін, у 1967—76 у Ін-це прадуктаў харчавання г. Норыдж. Навук. працы па выдзяленні і раздзяленні біялагічна актыўных злучэнняў. Распрацаваў метады размеркавальнай храматаграфіі на паперы (1944). Нобелеўская прэмія 1952 (разам з А.Д.П.*Марцінам*).

Р.Сінг.

СІНГАМІ́Я, тое, што *апладненне*.

СІНГАНІ́Я (ад грэч. syn разам + gōnia вугал), крышталеграфічная сістэма, сукупнасць крышталёў, элементарныя ячэйкі якіх характарызуюцца аднолькавымі *сіметрыяй крышталёў* і крышталеграфічнай сістэмай восей каардынат. Паводле суадносін паміж даўжынямі рэбраў (a, b, c) і вугламі (α, β, γ), ячэйкі адрозніваюць 7 С. (32 віды сіметрыі): кубічная (a=b=c, α=β=γ=90°), мае 5 відаў (груп, класаў) сіметрыі; тэтраганальная (a=b≠c, α=β=γ=90°), 7 відаў; гексаганальная (a=b≠c, α=β=90°, γ=120°), 7 відаў; трыганальная (a=b=c, α=β=γ≠90°), 5 відаў; рамбічная (a≠b≠c, α=β=γ=90°), 3 віды; манаклінная (a≠b≠c, α=γ=90°, β≠90°), 3 віды; трыклінная (a≠b≠c, α≠β≠γ≠90°), 2 віды сіметрыі. Часам вылучаюць 2 падсінганіі гексаганальнай С. — трыганальную і гексаганальную. С. групуюцца ў 3 катэгорыі: вышэйшая (кубічная), сярэдняя (тэтраганальная, гексаганальная, трыганальная) і ніжэйшая (рамбічная, манаклінная, трыклінная). Крышталі ніжэйшай катэгорыі найменш сіметрычныя, характарызуюцца некалькімі адзінкавымі напрамкамі (не менш за 3), сярэдняй — адным адзінкавым напрамкам, вышэйшай — найб. сіметрычныя, не маюць адзінкавых напрамкаў. З дапамогай С. вызначаюць мінералы і інш. крышт. рэчывы. Каля 38% мінералаў крышталізуюцца ў трыкліннай і манаклінай, 23% — у рамбічнай, 10% — у трыганальнай, 7,5% — у гексаганальнай, 9,5% — у тэтраганальнай, 12% — у кубічнай сінганіях. *В.І.Ярцаў.*

СІНГАПУ́Р (малайскае Singapura, англ. Singapore), Рэспубліка Сінгапур (малайскае Republik Singapura, англ. Republic of Singapore), дзяржава ў Паўд.-Усх. Азіі, на в-ве Сінгапур (пл. 570 км²) і прылеглых дробных астравах (каля 50), каля паўд. берагоў п-ва Малака. Джахорскім прал. (перасечаны дамбай з чыгункай, шашой і магістральным водаправодам) аддзелены ад тэр. Малайзіі, Сінгапурскім — ад Інданезіі. Пл. 648 км². Нас. 4151,3 тыс. чал. (2000). Дзярж. мовы — малайская, кітайская, англійская, тамільская. Сталіца — г. *Сінгапур*. Нац. свята — Нацыянальны дзень (9 жн.).

Дзяржаўны лад. С. — рэспубліка з парламенцкай формай праўлення. Чл. Садружнасці на чале з Вялікабрытаніяй. Дзейнічае канстытуцыя 1991 (з папраўкай 1993). Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт, які выбіраецца на прамых усеагульных выбарах тэрмінам на 6 гадоў. Аднапалатны парламент выбіраецца на 5 гадоў. Выканаўчая ўлада належыць ураду на чале з прэм'ер-міністрам.

Прырода. Рэльеф раўнінны (выш. да 176 м). Клімат экватарыяльны мусонны, гарачы і вільготны. Т-ра ўвесь год 26—28 °С. Выпадае каля 2500 мм ападкаў за год. Амаль уся тэрыторыя забудавана, ёсць паркі і скверы. Захаваліся невял. балоты, рэшткі трапічных лясоў (каля 5% тэр.), каля берагоў мангравыя зараснікі. Ёсць некалькі рэзерватаў, запаведнік на г. Букітымах, сусв. вядомы бат. сад.

Насельніцтва. Жывуць кітайцы (76%), малайцы (15%), выхадцы з Паўд. Азіі, пераважна тамілы (7%), еўрапейцы (англічане, французы, партугальцы), нашчадкі ад мяшаных шлюбаў еўрапейцаў з прадстаўнікамі азіяцкіх народаў, арабы і інш. Вернікі — будысты, канфуцыянцы, мусульмане, індуісты, хрысціяне. Сярэднегадавы прырост каля 1% за год. Сярэдняя шчыльн. насельніцтва больш за 6400 чал. на 1 км², адна з найб. у свеце. Усё насельніцтва гарадское, жыве ў г. Сінгапур (3567 тыс. ж.), суседніх гарадах і пасёлках. У прам-сці занята 25,6% працаздольных, у сельскай гаспадарцы — 1%, у фінансах і банкаўскай справе — 33,5%, у буд-ве — 6,6%, у кіраванні і абслуговых галінах — 33,3%.

Гісторыя. У сярэдневякоўі тэр. С. ўваходзіла ў склад розных малайска-інданез. дзяржаў (Шрывіджаі, Малакскага султаната і інш.). Пасля войнаў 13—14 ст. да пач. 19 ст. яна амаль незаселена. У 1819 брыт. губернатар Явы Т.С.Рафлз выкупіў в-аў Сінгапур у султана Джахора, заснаваў тут факторыю С., вакол якой вырас горад — адзін з найб. гарадоў Паўд.-Усх. Азіі; з 1826 асобная калонія Вялікабрытаніі. У 1942—45 С. акупіраваны яп. войскамі. У 1954 створана Партыя нац. дзеяння (ПНД). У 1959 С. атрымаў самакіраванне. У 1963—65 у складзе Федэрацыі Малайзія, з 9.8.1965 — незалежная дзяржава. Урад ПНД (напачатку на чале з прэм'ер-міністрам *Лі Куан Ю*, з ліст. 1990 — Го Чок Тонгам) ажыццяўляе палітыку прыцягнення замежнага капіталу і развіцця рыначнай эканомікі, што прывяло да хуткага эканам. росту С. і ператварэння яго да пач. 1990-х г. у адну з найб. развітых краін Азіі. С. — чл. ААН (з 1965), Арг-цыі дзяржаў Паўд.-Усх. Азіі. Дыпламат. адносіны паміж С. і Рэспублікай Беларусь усталяваны ў жн. 1992. Гал. паліт. партыя — Партыя нац. дзеяння, інш. партыі не адыгрываюць значнай ролі ў паліт. жыцці С.

Гаспадарка. С. — найб. развітая ў эканам. адносінах краіна Паўд. - Усх. Азіі. Разам з Тайванем і Паўд. Карэяй трывала ўваходзіць у лік «новых індустр. краін». Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) — 91,7 млрд. дол., каля 22 100 дол. на душу насельніцтва (2000). У прам-сці ствараецца каля 30% ВУП, у транспарце і сувязі — 13%, у сельскай гаспадарцы — 0,2%, у сферы абслугоўвання каля 57%. С. — буйны рэгіянальны і міжнар. цэнтр гандлю, фінансаў, маркетынгу, паслуг і распрацовак найноўшых тэхналогій, важнейшы



Герб і сцяг **Сінгапура**.

трансп. і камунікацыйны вузел Паўд.-Усх. Азіі. Аснова эканомікі — традыц. знешнегандл. аперацыі (гал. чынам рээкспарт) і экспартныя галіны прам-сці (на імпартнай сыравіне). У прам-сці 3 групы галін: суднабудаванне і суднарамонт (2-е, пасля ЗША, месца ў свеце па вытв-сці перасоўных буравых установак для распрацоўкі марскіх радовішчаў нафты), нафтаперапрацоўка (5 з-даў сумарнай магутнасцю перапрацоўкі 60 млн. т нафты за год, 3-е месца ў свеце) і нафтахімія; электроніка, радыё- і

электратэхніка (персанальныя камп'ютэры, інтэгральныя схемы, перыферыйныя сістэмы, абсталяванне аўтаматызаванага праектавання, сродкі навігацыі і сувязі, фотаоптыка, гадзіннікі і інш.), зборка і рамонт самалётаў, аўтамабіляў, матацыклаў, веласіпедаў; лёгкая (тэкст., швейная, трыкатажная) і харчовая. Вытв-сць электраэнергіі 28 млрд. кВт·гадз (1999), усе электрастанцыі цеплавыя, працуюць на вадкім паліве. Захавалі сваё значэнне традыц. галіны: волаваплавільная, перапрацоўка каўчуку і гумавая прам-сць, дрэваапрацоўка. Дзейнічаюць старэйшы ў Паўд.-Усх. Азіі металург. з-д поўнага цыкла, інш. прадпрыемствы чорнай і каляровай металургіі. Высокаразвітая ваен. прам-сць, прадукцыя якой ідзе пераважна на экспарт (стралковая зброя, патрульныя марскія катэры, радыёапаратура, боепрыпасы і інш.). Рээкспарт каўчуку, волава, копры, драўніны, вострых прыпраў (найб. перцу). Развіта аказанне разнастайных інфарм., фін., тэхнал., мед. і турыстычных паслуг. С. — буйны фін. цэнтр (саступае толькі Лондану, Нью-Йорку і Токіо). Працуюць валютныя і фондавыя біржы, 141 банк, у т.л. 128 замежных. Праводзяцца буйныя міжнар. гандл.-прамысл. выстаўкі, навукова-тэхн. сімпозіумы і канферэнцыі. Штогод С. наведвае больш за 7 млн. турыстаў з суседніх краін, Японіі, Кітая, ЗША і інш. У 1998 даход ад турызму склаў 5,79 млрд. дол. Сельская гаспадарка мае другаснае значэнне. С.-г. ўгоддзі займаюць каля 1,3 тыс. га. Вырошчваюць гевею, какосавую пальму, вострыя прыправы, тытунь, агародніну, садавіну, кветкі. Развіты свінагадоўля (у 1997 — 190 тыс. свіней) і птушкагадоўля (2 млн. курэй). Марское рыбалоўства (штогадовы ўлоў 13—15 тыс. т рыбы). Транспарт пераважна марскі. У С. — буйнейшы ў рэгіёне транзітны марскі порт (прымае за суткі ў сярэднім 150 суднаў, 2-гі ў свеце пасля Ротэрдама па грузааабароце). У порце — зона свабоднага гандлю. Марскі флот налічвае больш за 500 суднаў. Даўж. чыгункі 38,6 км, аўтадарог і вуліц 3017 км. У краіне 379,5 тыс. легкавых, 140,8 тыс. грузавых аўтамабіляў і аўтобусаў (1997). Аэрапорт Чангі — адзін з найбуйнейшых у свеце. Трубаправодны транспарт заняты транспарціроўкай пітной вады з Малайзіі і Інданезіі. У 1998 экспарт склаў 128 млрд. дол., імпарт — 133,9 млрд. дол. Экспартуюцца і рээкспартуюцца нафтапрадукты (8% сусв. гандлю імі), вылічальная тэхніка і радыётэлевізійнае абсталяванне (каля 14% сусв. аб'ёму), камунікацыйнае і офіснае абсталяванне, марскія судны і платформы, хім. прадукты, машыны і абсталяванне, каўчук, тэкст. і швейныя вырабы, алей, лесаматэрыялы, волава і інш. У імпарце пераважаюць сыравінныя тавары і харч. прадукты. Асн. гандл. партнёры: Малайзія (19% экспарту, 15% імпарту), ЗША (18% і 15% адпаведна), Японія (21% імпарту), Інданезія, Кітай, Тайланд, Паўд. Карэя і інш. Грашовая адзінка — сінгапурскі долар.

З.М.Шуканава (прырода, насельніцтва, гаспадарка).

Да арт. **Сінгапур** (дзяржава). Жылыя кварталы г. Сінгапур.

СІНГАПУ́Р (малайскае Singapura, англ. Singapore), горад, сталіца Рэспублікі *Сінгапур*, буйны эканам. цэнтр Паўд.-Усх. Азіі, каля Сінгапурскага праліва. Засн. ў канцы 13 ст., у 1365 быў разбураны ў выніку ваен. дзеянняў. У 1819 перайшоў да англічан. 3567 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Адзін з найбуйнейшых марскіх партоў свету (штогадовы грузааабарот больш за 400 млн. т). Міжнар. аэрапорт. Чыгункай і шашой звязаны з п-вам Малака. Міжнар. валютна-фін. цэнтр, буйны цэнтр гандлю сыравіннымі таварамі (натуральны каўчук, прадукты какосавай пальмы, драўніна, вострыя прыправы, фрукты, кава, волава). Важны цэнтр нафтаперапрацоўкі. Прам-сць: эл.-тэхн., хім., нафтахім., маш.-буд., суднабуд. і суднарамонт, гумавая, цэм., дрэваапр., харчовая; новыя галіны — радыёэлектронная, вытв-сць трансп. абсталявання, тэкстыльная і швейная, оптыка-механічная. Бункероўка суднаў. Ун-ты. Музеі. Бат. сад, марскі акварыум.

СІНГАПУ́РСКІ ПРАЛІ́Ў. Паміж паўд. часткай п-ва Малака і в-вам Сінгапур на Пн і архіпелагам Рыау на Пд. Злучае Паўд.-Кітайскае м. і Андаманскае м. праз Малакскі праліў. Даўж. 114 км, шыр. 12—37 км, найменшая глыб. на фарватэры 22 м. Порт Сінгапур.

СІНГАРМАНІ́ЗМ (ад грэч. syn разам + гармонія) у м о в а з н а ў с т в е, марфаналагічная з'ява, якая заключаецца ў прыпадабненні галосных гукаў (прагрэсіўная *асіміляцыя)*, што ўваходзяць у склад афіксаў, да галосных кораня па прыкмеце месца ўтварэння, лабіялізацыі і інш. На С. уплывае і характар апошняга зычнага кораня (пярэдне- ці заднеязычны). Напр., турэцкі суфікс мн. л. набывае розную фанетычную будову ў залежнасці ад фанетычнай структуры кораня (параўн.: ev дом — evler дамы, але ok стрэл — oklar стрэлы). С. уласцівы пераважна *аглюцінатыўным мовам*, у якіх ён забяспечвае функцыянальна (як *націск* у індаеўрап. мовах) цэласнасць і адасобленасць словаформы.

Літ.: Ч е р к а с с к и й М.А. Тюркский вокализм и сингармонизм. М., 1965; В и н о г р а д о в В.А. Типология сингармонических тенденций в языках Африки и Евразии // Проблемы африканского языкознания. М., 1972.

А.Я.Міхневіч.

СІНГУЛЯ́РНАЕ РАЗМЕРКАВА́ННЕ ў т э о р ы і і м а в е р н а с ц е й, размеркаванне імавернасцей у *n*-мернай вектарнай прасторы, якое засяроджана на мноства нулявой меры Лебега і прыпісвае кожнаму аднапунктаваму мноству нулявую імавернасць. У больш шырокім сэнсе — кожнае *размеркаванне* імавернасцей з'яўляецца С.р. у адносінах да меры *P* (гл. *Мера* мноства), калі яно засяроджана на мноства *N* такім, што яго мера $P\{N\}=0$. У гэтым выпадку любое дыскрэтнае размеркаванне імавернасцей з'яўляецца С.р. у адносінах да меры Лебега.

С.р. (адносна меры Лебега), зададзенае на прамой, мае неперарыўную функцыю размеркавання, мноства пунктаў росту якой мае Лебегаву меру нуль. Напр., кантарава размеркаванне, якое мае выпадковая велічыня $Y = 2(1/3X_1+1/3^2X_2+...+1/3^jX_j+...)$, дзе X_1, X_2,... — паслядоўнасць незалежных выпадковых велічынь, якія прымаюць значэнні 0 і 1 з імавернасцю 1/2. Любое размеркаванне імавернасцей у эўклідавай *n*-мернай прасторы можна адназначна выразіць праз камбінацыю дыскрэтнага, неперарыўнага і сінгулярнага размеркаванняў: $P=aP_{\text{дыскр}}+bP_{\text{непер}}+cP_{\text{сінг}}$, дзе a, b, $c \geq 0$ і $a+b+c=1$ (раскладанне Лебега).

Б.А.Залескі.

СІНГУЛЯ́РНАСЦЬ (ад лац. singularis асобны, асаблівы) к а с м а л а г і ч н а я, асаблівы стан у пачатку касмалагічнага расшырэння *Сусвету* ў фрыдманаўскіх і некаторых інш. касмалагічных мадэлях агульнай *адноснасці тэорыі* (АТА), што ляжаць у аснове сучаснай *касмалогіі*. Характарызуецца разбежнымі значэннямі шчыльнасці энергіі матэрыі, інварыянтаў тэнзара крывізны і інш. параметраў.

Існаванне Сусвету ў часе ў рамках гэтых мадэлей у мінулым абмежавана касмалаг. С. Наяўнасць яе ў касмалаг. рашэннях АТА сведчыць аб непрыдатнасці класічнай АТА у вобласці экстрэмальных умоў. Рабілася мноства спроб рашэння праблемы С., якія прывялі да пабудовы некаторых рэгулярных касмалаг. мадэлей, у прыватнасці, пабудаваны рэгулярныя закрытыя інфляцыйныя касмалаг. мадэлі ў рамках АТА і калібровачных тэорый гравітацыі. Існаванне Сусвету ў такіх мадэлях у мінулым і будучым не абмежавана ў часе. Стадыі касмалаг. расшырэння папярэднічае стадыя сціскання, а замест С. выступае стан з экстрэмальна вялікімі (магчыма, планкаўскімі) значэннямі шчыльнасці энергіі, т-ры і інш. параметраў. З гэтага стану пачынаецца *расшырэнне Сусвету*, якое падобна да Вялікага Выбуху і мае экспаненцыяльны характар у інфляцыйных мадэлях. Згодна з тэарэт. і назіральнымі данымі працягласць касмалаг. расшырэння («узрост Сусвету») у межах 10—20 млрд. гадоў.

Літ.: С и л к Дж. Большой взрыв: Пер. с англ. М., 1982; В а й н б е р г С. Первые три

минуты: Пер. с англ. М., 1981; Хокинг С. Краткая история времени: От большого взрыва до черных дыр: Пер. с англ. СПб., 2000; Minkevich A.V. Vacuum gravitational repultion effect and regular inflationary cosmology // X International Seminar «Nonlinear Phenomena in Complex Systems». Minsk, 2001. *А.В.Мінкевіч.*

СІНД, правінцыя на ПдУ Пакістана, у бас. нізоўяў р. Інд. Мяжуе на У з Індыяй, на Пд абмываецца Інд. ак. Пл. 151,4 тыс. км^2, нас. каля 35,7 млн. чал. (2000), пераважна сіндхі. Адм. і гал. прамысл. цэнтр — г. *Карачы*. Паверхня раўнінная і нізінная. Клімат субтрапічны. Ападкаў каля 100 мм за год. Адзіная р. Інд, якая шырока выкарыстоўваецца на арашэнне. Натуральная расліннасць пустынная і паўпустынная. У С. (пераважна ў г. Карачы) засяроджана амаль палавіна прамысл. вытв-сці краіны; буйныя прамысл. цэнтры *Хайдарабад* і *Сукур*. Асн. галіны прам-сці: тэкст., харч. і харчасмакавая, хімічная. Ёсць прадпрыемствы машынабудавання і металаапрацоўкі. Шматгаліновае арашальнае земляробства ў даліне Інда. С. дае каля 50% агульнанац. збору рысу, 15% пшаніцы і цукр. трыснягу, 30% бавоўны і алейных культур, 35% джавара (від проса). Характэрна высокая таварнасць с.-г. вытворчасці. Жывёлагадоўля мае другараднае значэнне, буйн. раг. жывёла выкарыстоўваецца як цяглавая сіла. Рыбалоўства. Транспарт чыг. і аўтамабільны. Знешнія сувязі марскім транспартам.

«СІНДБА́Д-НАМЕ́», помнік персідскатадж. л-ры. Складаецца з 34 абрамленых прытчаў. У аснове сюжэта апавяданні пра царэвіча, на якога быў узведзены паклёп рабыняй бацькі, і сем везіраў на чале з мудрым выхавацелем, якія даказваюць невінаватасць сына. Першааснова «С.-н.» — стараж.-інд. апавяданні, перакладзеныя на сярэднеіранскую мову пехлеві ў 5—6 ст. У 8 ст. перакладзены на араб. мову. Найб. вядомы празаічны пераклад Асбага Сіджыстані, т. зв. «Вялікі Сіндбад»; у той самы час з'явіўся паэтычны пераклад Абана аль-Лахікі. У 9 ст. зроблены скарочаны пераклад на араб. мову — «Малы Сіндбад», які перакладзены на многія еўрап. мовы. Новааараб. варыянт пад назвай «Сем везіраў» пакладзены ў аснову тур. версіі «Сем мудрацоў», якая амаль уся ўвайшла ў збор казак «Тысяча і адна ноч».

Публ.: Рус. пер. — Мухаммад аз-Захири ас-Самарканди. Синдбад-наме. М., 1960.

СІНДРО́М (ад грэч. syndromē намнажэнне, збег), сукупнасць *сімптомаў*, абумоўленых адзіным механізмам узнікнення хваробы (*патагенезам*), якія характарызуюць вызначаны паталаг. стан арганізма. У некат. выпадках адлюстроўвае ўсё захворванне цалкам, зрэдку адзін і той жа С. сустракаецца пры розных захворваннях. Напр., гемарагічны С. назіраецца пры вострым лейкозе, гемафіліі, цырозе печані і інш. Сучасная медыцына вылучае каля 1500 С.

СІНДРО́М НАБЫ́ТАГА ІМУНАДЭФІЦЫ́ТУ, СНІД, вірусная хвароба, якая характарызуецца пашкоджаннем імуннай сістэмы; адна з найб. цяжкіх *аўтаімунных хвароб*. Як самаст. хвароба выяўлены ў 1981 у ЗША. Найб. пашыраны ў краінах Афрыкі, Азіі, Амерыкі. Узбуджальнік — вірус (ВІЧ — вірус імунадэфіцыту чалавека), які разбурае Т-лімфацыты і макрафагі. Узбуджальнік не перадаецца паветрана-кропельным шляхам, пры быт. кантактах, праз посуд. Заражэнне адбываецца пры палавых кантактах, праз кроў і яе прэпараты, органы, тканкі інфіцыраванага донара. Магчыма ўнутрывантробнае заражэнне плода праз плацэнту і ў час родаў.

Групы павышанай рызыкі — наркаманы, гомасексуалы, хворыя на венерычныя захворванні. СНІД уключае разнастайныя другасныя інфекцыі, неўралагічныя парушэнні, злаякасныя новаўтварэнні. Першасныя праявы СНІДу (ліхаманка, павелічэнне лімфавузлоў і інш.) узнікаюць у перыяд ад 3 сут да некалькіх месяцаў, другасныя, абумоўленыя непасрэдна дзеяннем ВІЧ (гнойна-запаленчыя працэсы, пнеўманіі і інш.), цягнуцца ад некалькіх месяцаў да 8—10 гадоў.

Літ.: Покровский В.В. Эпидемиология и профилактика ВИЧ-инфекции и СПИД. М., 1996; ВИЧ-инфекция: клиника, диагностика и лечение. М., 2000. *М.З.Ягоўдзік.*

СІ́НДЫКА, назва тэрыторыі, якую насялялі стараж. плямёны сіндаў, а таксама іх дзяржавы ў 5—4 ст. да н.э. Знаходзілася на тэр. Таманскага п-ва (Расія). Асн. заняткамі жыхароў былі земляробства, рыбалоўства і гандаль. Як дзяржава С. склалася ў 5 ст. да н.э. ў выніку войнаў сіндаў са *скіфамі*, што прывяло да ўзмацнення ўлады сіндскіх военачальнікаў. Вызначалася найб. ступенню элінізацыі ў параўнанні з інш. абласцямі Прычарнамор'я. У 4 ст. да н.э. страціла самастойнасць і ўключана ў склад Баспорскага царства.

СІНДЫКА́Т (нам. Syndikat ад грэч. syndikos які дзейнічае сумесна), 1) пагадненне картэльнага тыпу, якое прадугледжвае, што яго ўдзельнікі збываюць свае тавары праз адзіную гандл. кантору (звычайна ствараецца ў выглядзе акц. т-ва або т-ва з абмежаванай адказнасцю), якая ажыццяўляе таксама закупкі для ўдзельнікаў С. Яны захоўваюць вытв. і юрыд. самастойнасць, але ў адрозненне ад *картэля* страчваюць камерцыйную незалежнасць. 2) Аб'яднанне, у якое ўваходзяць прадпрыемствы, што вырабляюць масавую аднатыпную прадукцыю. 3) Назва прафес. саюзаў у некаторых краінах, напр. у Францыі.

СІНЕГАЛО́ВІК (Eryngium), род кветкавых раслін сям. парасонавых. Каля 230 відаў. Пашыраны ва ўмераных, трапічных і субтрапічных паясах. На Беларусі 1 від — С. пласкалісты (E. planum). Трапляецца на сухіх грывах у поймах рэк, пясчаных узлесках, уздоўж дарог. Інтрадукаваны С.: альпійскі (E. alpinum), аметыставы (E. amethystinum), ганцкі (E. giganteum), палявы (E. campestre).

Шматгадовыя, радзей адна- і двухгадовыя травы з прамастойнымі галінастымі сцёбламі. Лісце чаргаванае, разнастайнай формы, часта скурыстае і калючазубчастае. Кветкі двухполыя, дробныя ў шчыльных галоўчатых суквецціях пераважна сіне-блакітнага колеру. Суквецці абкружаныя цвёрдымі лісцікамі абгорткі. Плод — сямянка. Калючы, моцна разгалінаваны С. палявы ўтварае *перакаці-поле*. Дэкар. (для зімовых букетаў і фларыстыкі), лек., харч., меданосныя расліны.

А.М.Скуратовіч.

Сінегаловік палявы.

СІ́НЕ-ЗЯЛЁНЫЯ ВО́ДАРАСЦІ, цыянавыя водарасці (Cyanophyta, або Cyanomycota), аддзел водарасцей. 3 кл.: храакокавыя, хамесіфонавыя і гармагоніевыя водарасці. Паводле будовы клетак (у т.л. арганізацыі ядзернага апарату, саставу і генет. уласцівасцей) адносяцца да *пракарыётаў*, а таксама да *бактэрый* і наз. *цыянабактэрыямі*. Адначасова С.-з.в. ўключаюць у бат. класіфікацыю, якая з'яўляецца філагенетычнай, і наз. цыянапракарыётамі. Каля 150 родаў, 2 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды. Вядомы з дакембрыю (узрост некат. з іх больш за 3 млрд. гадоў). На Беларусі 327 відаў, разнавіднасцей і форм з 55 родаў: *асцыляторыя, насток*, мікрацыстыс, афанізаменон, глеятрыхія, глеякапса, фармідыум, калотрыкс, спіруліна, афанатэцэ, сінехакокус і інш.

Аднаклетачныя, каланіяльныя і шматклетачныя (ніткаватыя) арганізмы, мікраскапічныя, часта ўтвараюць буйныя скопішчы ў выглядзе корак і кусцікаў выш. да 20 см (у трапічных морах). Афарбоўка ад сіне-зялёнай да чырвонай. Фотасінтэзуючыя, маюць хларафіл *a*, караціноіды і асобныя пігменты — фікабіліпратэіды. Для С.-з.в. характэрна адсутнасць жгуцікавых стадый і палавога працэсу.

Размнажэнне вегетатыўнае. Уваходзяць у склад планктону, бентасу прэсных вод і мораў, жывуць на паверхні глебы, у гарачых крыніцах з т-рай вады да 80 °С, у вапнавым субстраце, гарах, Арктыцы і Антарктыцы. З'яўляюцца піянерамі жыцця ў крайніх умовах існавання. Часта знаходзяцца ў сімбіятычных адносінах з іншымі арганізмамі: аднаклетачнымі водарасцямі, што страцілі хларапласты, прасцейшымі, грыбамі (лішайнікі), моха- і папарацепадобнымі, сагаўнікавымі, пакрытанасеннымі. Выконваюць ролю азотфіксатараў і выкарыстоўваюцца як угнаенне (напр., на рысавых палях). Выклікаюць «цвіценне» вады ў вадасховішчах. Некат. ўжываюцца ў ежу (насток, спіруліна), выкарыстоўваюцца для культывавання (напр., для вырабу лекаў).

Літ.: Громов Б.В. Ультраструктура сине-зеленых водорослей. Л., 1976; Гусев М.В., Никитина К.А. Цианобактерии. М., 1979; Komárek J., Anagnostidis K. Cyanoprokaryota. // Süsswasserflora von Mittel europa. Jena etc., 1999. Bd. 19, t.1.

Т.М.Міхеева.

СІНЭ́КДАХА (ад грэч. synekdochē суперайманне, суаднясенне), від *метаніміі*, заснаваны на замене аднаго паняцця другім на аснове суаднясення іх колькасных прыкмет. Выступае як сродак завастрэння ўвагі чытача на найб. значных маст. дэталях, якім у творы належыць важная роля ў эмацыянальна-псіхал. раскрыцці вобразаў, іх аўтарскай ацэнцы. Пашырана ўжыванне назвы часткі з'явы, прадмета ў значэнні цэлага:

Магутнае слова, ты, роднае **слова**!
Са мной ты наяве і ў сне,
Душу мне затрэсла пагудкаю новай,
Ты песень наўчыла мяне.

(Я.Купала. «Роднае слова»)

Часам назва часткі замяняецца назвай цэлага:

Край калхідскі сёння ў славе,
І палескі краявід
Зменім мы, балоты сплавім,
Тут, брат, тысячы **Калхід**!

(П.Панчанка. «Слова пра Палессе»)

Сустракаецца замена множнага ліку адзіночным і наадварот:

Якія толькі стагоддзі
цябе не хрысцілі
ў сваіх **Дняпрах**, а ты
язычнікам
так і застаўся, Човен.

(Р.Барадулін. «Трыпціх Ушаччыны»)

Разнавіднасць С. — ужыванне ўласных імён у значэнні агульных назоўнікаў:

Працы ў зорках — акіян бязмерны,
Важна, што мы здолелі пачаць.
Сотні новых **Юрыяў** і **Германаў**
У калысках ярасна крычаць.

(П.Панчанка. «У. космас»)

А.А.Майсейчык.

СІНЕКЛІ́ЗА (ад грэч. syn разам + enklisis нахіленне), вялікі (да некалькіх сотняў метраў, часам больш за 1 тыс. км у папярочніку) няправільна-авальнай ці акруглай формы пакаты прагін у межах платформы. Нахіл слаёў на крылах — долі градуса, на флексурах да 1°. Запоўнена магутнай тоўшчай (ад 3 да 8 км, радзей да 20 км) асадкавых або вулканагенна-асадкавых парод. Ускладнена структурамі 2-га (скляпенні, упадзіны), 3-га (валы, дэпрэсіі) і больш дробных парадкаў. Развіваюцца на працягу аднаго або некалькіх тэктанічных цыклаў, нярэдка над *аўлакагенамі*. Адрозніваюць С. накладзеныя, унаследаваныя, краявыя (вузлавыя), трапавыя і інш. Да С. часта прымеркаваны артэзіянскія, вугляносныя, саляносныя, нафтаносныя і інш. басейны. Тэрмін прапанаваны сав. геолагам А.П.Паўлавым у 1903. На тэр. Беларусі заходзіць ч. *Маскоўскай сінеклізы*. Гл. таксама *Антэкліза*.

І.В.Клімовіч.

СІНЕКУ́РА (ад лац. sine cura без клопату), царкоўная пасада ў сярэдневяковай Еўропе, якая прыносіла даходы, але не была звязана з выкананнем пэўных абавязкаў і знаходжаннем на месцы служэння. У пераносным сэнсе абазначае пасаду, якая добра аплачваецца, але не патрабуе асаблівых намаганняў.

СІНЕ́ЛЬНІКАВА Людміла Мікалаеўна (н. 24.7.1950, г. Варонеж, Расія), бел. і рас. балерына. Засл. арт. Беларусі (1979). Скончыла Варонежскае харэагр. вучылішча (1968). Працавала ў т-рах оперы і балета Варонежа і Казані. У 1972—82 салістка Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Яе творчая індывідуальнасць найб. ярка выявілася ў партыях лірычнага плана. Сярод партый на бел. сцэне: Папялушка («Папялушка» С.Пракоф'ева), Марыя («Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева), Ева («Стварэнне свету» А.Пятрова), Адэта — Адылія («Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага), Раймонда («Раймонда» А.Глазунова), Жызэль («Жызэль» А.Адана), Ліза («Ліза і Кален» Л.Герольда), Радысачка («Чыпаліна» К.Хачатурана). Выконвала мазурку і прэлюд у балеце «Шапэніяна» на музыку Ф.Шапэна і інш. Лаўрэат Міжнар. конкурсу артыстаў балета (Варна, 1970).

СІНЕ́ЛЬНІКАЎ Мікалай Мікалаевіч (12.2.1855, г. Харкаў, Украіна — 19.4.1939), расійскі і ўкраінскі рэжысёр, акцёр. Нар. арт. Украіны (1934). Нар. арт. Расіі (1934). З 1873 акцёр, пазней і рэжысёр у т-рах Харкава, Мікалаева, Казані і інш. У 1900—09 гал. рэжысёр Т-ра Корша ў Маскве, у 1910—13 трымаў антрэпрызу ў Харкаве і Кіеве. Рэфарматар правінцыяльнай сцэны, вял. ўвагу аддаваў акцёрскаму ансамблю. Увёў сістэму абанементаў і спектакляў для моладзі па зніжаных цэнах. Пасля 1917 у т-рах Саратава, Растова-на-Доне, з 1933 у Харкаўскім рус. драм. т-ры. Сярод лепшых пастановак: «Плады асветы» Л.Талстога (1893), «Дзядзька Ваня» А.Чэхава (1897), «Дзеці Ванюшына» С.Найдзёнава (1901), «Гора ад розуму» А.Грыбаедава (1934), «Таленты і паклоннікі» А.Астроўскага (1935) і інш. Выкладаў у Харкаўскім тэатр. вучылішчы.

Тв.: Шестьдесят лет на сцене. Харьков, 1935.

Літ.: Слонова Н. Н.Н.Синельников. М., 1956.

СІНЕ́НКА Георгій Дзмітрыевіч (н. 9.11.1923, с. Сватава Луганскай вобл., Украіна), бел. літаратуразнавец, крытык. Канд. філал. н. (1970). Скончыў Харкаўскі ун-т (1950). Настаўнічаў, працаваў на ніве нар. асветы ў Беларусі. У 1970—94 выкладчык БДУ. Друкуецца з 1960. Даследуе рус.-бел., бел.-балгарскія літ. ўзаемасувязі, праблемы развіцця сучаснай бел. прозы і паэзіі, жанры і стылі бел. л-ры. Аўтар манаграфій «Іван Навуменка», «Ніл Гілевіч» (абедзве 1981), «Ф.В.Гладкоў. Семінарый» (1982), «Насуперак канону» (1997, пра А.А.Лойку), арт. пра А.Адамовіча, М.Арочку, Гладкова, М.Даніленку, В.Карамазава, М.Лынькова і інш.

І.У.Саламевіч.

СІНЕРГЕ́ТЫКА (ад грэч. synergētikos супольны, які дзейнічае ўзгоднена), навуковы кірунак, які вывучае агульныя прынцыпы эвалюцыі і самаарганізацыі макраскапічных сістэм. Тэрмін прапанаваны ням. фізікам Г.Хакенам у 1970-я г. Макраскапічныя сістэмы складаюцца з многіх элементаў, што ўзаемадзейнічаюць паміж сабой і могуць фарміраваць прасторавыя, часавыя ці функцыянальныя структуры без знешняга ўздзеяння; працэсы ўпарадкавання ў такіх сістэмах узнікаюць у выніку ўзаемадзеяння вял. колькасці элементарных падсістэм. С. грунтуецца на тэрмадынаміцы нераўнаважных працэсаў, тэорыях выпадковых працэсаў, інфармацыі і нелінейных ваганняў і хваль.

Асн. паняцці С. — устойлівасць, няўстойлівасць, парадак, хаос (найб. неўпарадкаваны стан), лінейнасць, нелінейнасць, параметр парадку, прынцып падпарадкавання і інш. Цэнтр. праблема — узаемаадносіны парадку і хаосу (гл. *Энтрапія*). С. тлумачыць, як парадак (прасторавая ці часавая ўпарадкаваная структура) узнікае з канструктыўнага хаосу. Ідэі і метады С. выкарыстоўваюцца для аналізу прасторава-часавых структур у паняццях параметраў парадку і прынцыпу падпарадкавання, прадказання паводзін складаных сістэм, змяншэння размернасці дынамічнай сістэмы, а таксама ў тэорыі распазнавання вобразаў і інш.

На Беларусі даследаванні па праблемах С. вядуцца ў Ін-тах тэхн. кібернетыкі і фізікі Нац. АН, БДУ, Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі, Бел. эканамічным ун-це.

Літ.: Хакен Г. Информация и самоорганизация: Макроскопич. подход к сложным системам: Пер. с англ. М., 1991; Цымбал Л.А. Синергетика информационных процессов: Закон информативности и его следствия. М., 1995; Капица С.П., Курдюмов С.П., Малинецкий Г.Г. Синергетика и прогнозы будущего. М., 1997; Василькова В.В. Порядок и хаос в развитии социальных систем. Синергетика и теория социальной самоорганизации. СПб., 1999.

А.А.Барыскевіч.

СІНЕРГІ́ЗМ, сінергія (ад грэч. synergeia супрацоўніцтва, садружнасць), камбінаванае ўздзеянне 2 або некалькіх рэчываў на арганізм (сістэму), агульны эфект якога большы за сумарны эфект

уздзеяння кожнага з кампанентаў паасобку.

Рэчывы, што праяўляюць С., наз. сінергістамі, напр., лек. рэчывы — *адрэналін* і *атрапін*, якія выклікаюць расшырэнне зрэнак, праяўляльныя рэчывы ў фатаграфіі — *метол* і гідрахінон. У некат. выпадках С. назіраецца пры дзеянні сумесі актыўнага рэчыва з практычна неактыўным, напр., неактыўная *аскарбінавая кіслата* ўзмацняе антыакісляльнае дзеянне многіх фармацэўтычных *антыаксідантаў*, у хіміі яе сумесь з аксідам жалеза Fe_2O_3 выкарыстоўваюць для стабілізацыі палімераў.

СІНЕРЭ́ЗІС (ад грэч. synairesis сціскание, памяншэнне), самаадвольнае вылучэнне вадкасці са *студзянёў* і *геляў*; адна з праяў старэння розных відаў дысперсных структур, палімерных і біял. сістэм. С. прыводзіць да памяншэння аб'ёму студзеню або гелю за кошт ушчыльнення структурнай сеткі. Выкарыстоўваюць пры фармаванні хім. валокнаў з прадзільных растворaў, у тэхналогіі палімерных матэрыялаў, вытв-сці харч. прадуктаў (напр., сыру, тварагу).

СІНЕСТЭЗІ́Я (ад грэч. synaisthēsis адначасовае адчуванне), адзін з відаў *тропа*. Засн. на своеасаблівым спалучэнні розных асацыяцый: зрокавых, слыхавых, дотыкавых.

Пад полазам **белым**,
з'інелай падковай
Галінкай азяблаю
крохне —
хрусь,
Як яблык, **крамянае** і
хрупаткое
Слова **марознае**: «Беларусь».

(Р.Барадулін. «Заінелая Ушаччына»).

Паэт. вобраз ствараецца тут спалучэннем зрокавых і слыхавых асацыяцый.

А.А.Майсейчык.

СІНЕ́Ц (Abramis ballerus), рыба сям. карпавых атр. карпападобных. Пашыраны ў вадаёмах бас. Балтыйскага, Азоўскага, Каспійскага, Чорнага м. Жыве ў прэсных водах. На Беларусі ў невял. колькасці ў р. Дняпро і яго прытоках (Прыпяць, Сож, Бярэзіна). Нар. назвы кляпец, сіньга, сопа.



Сінец.

Даўж. цела да 40 см, маса да 1 кг. Падобны да *ляшча*. Адрозніваецца больш выцягнутым і сціснутым целам, дробнай луской, завостраным ротам, злёгку накіраваным угору, больш доўгім анальным плаўніком і інш. Спіна цёмна-сіняя (адсюль назва), бакі і бруха серабрыста-белыя з залацістым адлівам, няпарныя плаўнікі бледна-шэрыя, грудныя — жаўтаватыя з чарнаватай аблямоўкай. Корміцца зоапланктонам і бентасам.

СІ́НІ КІТ, гл. *Блакітны кіт*.

СІНІЙСКІ КО́МПЛЕКС, сіній (ад позналац. Sina Кітай), комплекс горных парод верхняга *дакембрыю*, адпавядае большай ч. *рыфею*. Вылучаны ням. геолагам Ф.Рыхтгофенам у 1882 на тэр. Кітая. Складзены ўнізе з кварцытаў, сланцаў і андэзітавых лаваў, уверсе пераважна з вапнякоў і даламітаў са страматалітамі. Магутнасць 8 тыс. м. У бас. р. Янцзы С.к. уключае характэрную пачку ледавіковых кангламератаў — *тылітаў*. З адкладамі С.к. звязаны радовішчы жалезных і марганцавых руд.

СІНІ́ЛАЎ Кузьма Раманавіч (14.5.1902, в. Бывалькі Лоеўскага р-на Гомельскай вобл. — 31.12.1957), генерал-лейтэнант (1944). Скончыў ваен. школу ВЦВК (1924), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1936). З 1919 у Чырв. арміі і войсках НКУС. Удзельнік грамадз. 1918—20, сав.-фінл. 1939—40 войнаў. У пач. Вял. Айч. вайны нач. пагранвойск Мурманскай акругі, камандзір дывізіі войск НКУС, з кастр. 1941 да 1953 камендант Масквы, потым выкладчык у ВНУ.

СІНІ́ЛЬНАЯ КІСЛАТА́, цыяністы вадарод, цыяніставадародная кіслата, нітрыл мурашынай кіслаты, слабая аднаасноўная к-та, HCN. У свабодным і звязаным стане ёсць у раслінах.

Бясколерная лёгкалятучая вадкасць з пахам горкага міндалю, $t_{кіп}$ 25,65 °С, шчыльн. 687,08 кг/м^3 (20 °С). Сумесь пары С.к. з паветрам (4,9—39,7% С.к.) выбухованебяспечная.

Змешваецца з вадой і многімі арган. растваральнікамі. З металамі ўтварае солі — *цыяніды*, арган. вытворныя С.к. — *нітрылы*. Асн. прамысл. метад атрымання С.к. — акісляльны *аманаліз* метану на каталізатары (сплаў плаціны з родыем) пры 1000 °С. Выкарыстоўваюць у вытв-сці цыянідаў, акрыланітрылу, акрылатаў і інш., як фумігант. Вельмі атрутная, затрымлівае акісляльныя і ферментатыўныя працэсы, паралізуе дыхальныя цэнтры і выклікае ўдушша; ГДК у атм. паветры 0,01 мг/м^3, у вадзе 0,1 мг/л.

СІНІ́Н, горад на ПнЗ Кітая, на р. Хуаншуй (бас. Хуанхэ). Адм. і гал. прамысл. цэнтр прав. Цынхай. Каля 1 млн. ж. з прыгарадамі (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: металургічная, маш.-буд., хім., папяровая, буд. матэрыялаў, харчовая. На ПнЗ ад С. — Датунскі кам.-вуг. басейн.

СІНІ́НГІЯ, род кветкавых раслін, гл. ў арт. *Глаксінія*.

СІ́НІСАЛА Гельмер-Райнер Нестаравіч (14.6.1920, г. Златауст Чэлябінскай вобл., Расія — 3.8.1989), карэльскі кампазітар. Нар. арт. СССР (1978). Вучыўся ў Маскоўскай і Ленінградскай кан-

Г.Сінісала.

серваторыях (1952—55). Яго творчасці ўласціва выкарыстанне нар. карэльскай музыкі, нац. эпасу «Калевала». Аўтар першых карэльскіх балета «Сампа» (1959) і твораў для арк., у т.л. сімфоніі «Волаты лесу» (1949). Сярод інш. твораў: балеты, кантаты, канцэрты для фп. і інш. інстр. з арк., для арк. кантэле, кам.-інстр. ансамблі, фп. п'есы, раманcы, песні, музыка для т-ра і кіно, апрацоўкі фін., карэльскіх, вепскіх і паморскіх нар. песень. Дзярж. прэмія Карэліі 1974. Дзярж. прэмія Расіі 1986.

Літ.: Городницкая Н.Ю. Г.-Р.Синисало. Л., 1984.

СІНІ́ЦАВЫЯ (Paridae), сямейства птушак атр. вераб'інападобных. 2 падсям.: *рэмезы* і сініцы (Parinae). 55 відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя Паўд. Амерыкі, Аўстраліі, в-ва Мадагаскар. Жывуць у лясах, парках, скверах, рэмезы зрэдку ў трыснягу. На Беларусі 8 відаў. Найб. пашыраны: сініца вялікая (Parus major), блакітніца звычайная (гл. *Блакітніцы*), сініца чубатая (P.cristatus), гаічка чорнагаловая (гл. *Гаічкі*). 2 віды — блакітніца белая і рэмез занесены ў Чырв. кнігу.

Да арт. **Сініцавыя**. Сініцы: 1 — вялікая; 2 — чорная, або маскоўка; 3 — чубатая. 4 — Гаічка чорнагаловая.

Даўж. цела 7,6—20 см, маса 7—25 г. Апярэнне мяккае. Ногі моцныя. Крылы невял., тупыя. Дзюба прамая, канічная, зрэдку вострая. Кормяцца насякомымі, насеннем, пладамі раслін. Нясуць 4—16 яец.

СІ́НІЦКАЕ ПО́ЛЕ, вёска ў Буйнавіцкім с/с Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калект. с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 35 км на У ад г.п. Лельчыцы, 202 км ад Гомеля, 58 км ад чыг. ст. Ельск. 407 ж., 135 двароў (2001). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

СІНІ́ЦКІ Іван Францавіч (1856 або 1861, Смаргоншчына, Гродзенская вобл. — 2.5.1939), бел. мемуарыст, падарожнік. Юнацтва правёў на Украіне. У 1893 вярнуўся ў г. Смаргонь, уключыўся ў рэв. барацьбу, арганізаваў б-ку, прапагандаваў творы Л.Талстога і М.Горкага, пісаў карэспандэнцыі ў віленскія газеты. З 1901 падарожнічаў за мяжою, напісаў кнігу «Новая Зеландыя — Еўропа» — першае на рус. мове апісанне Новай Зеландыі (забаронена цэнзурай, карэктурны адбітак зберагаецца ў Гродзенскім гіст.-археал. музеі). Перад рэвалюцыяй 1905—07 вярнуўся на радзіму. За актыўны ўдзел у рэв. падзеях арыштаваны і сасланы ў Валагодскую губ. У турме і ссылцы напісаў па просьбе М.Рубакіна ўспаміны «З майго жыцця ў вёсцы», прысвечаныя рэв. падзеям у Смаргоні ў канцы 19 — пач. 20 ст. (рукапіс зберагаецца ў Дзярж. б-цы Расіі, Масква). З ссылкі ўцёк у Фінляндыю. Вярнуўшыся на радзіму, устанавіў сувязі з газ. «Наша ніва», пісаў у яе карэспандэнцыі (магчыма, пад псеўданімам Смаргонец). У 1920—30-я г. падтрымліваў сувязь з Т-вам бел. школы.

Літ.: Дридзо А. Путешественник из Сморгони // Нёман. 1984. № 4; Каранеўскі А. Па слядах рэвалюцыянера і публіцыста // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1985. № 2. *А.В.Мальдзіс.*

СІНІ́ЦЫН Анатоль Канстанцінавіч (н. 5.2.1948, г. Міёры Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне фіз. электронікі і матэм. фізікі. Д-р фіз.-матэм. н. (1996), праф. (1997). Скончыў БДУ (1970). З 1970 у Ін-це цепла- і масаабмену АН Беларусі. З 1978 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі (з 1993 заг. кафедры). Навук. працы па даследаванні дынамічных працэсаў узаемадзеяння электронных патокаў з эл.-магн. палямі ў электравакуумных прыладах ЗВЧ на аснове матэм. мадэліравання і выліч. эксперыменту. Распрацаваў матэм. мадэлі і праграмы аналізу характарыстык і аптымізацыі параметраў прылад ЗВЧ.

Тв.: Математическое моделирование и проблема оптимизации по КПД ЛБВ-О (разам з А.А.Кураевым) // Зарубеж. радиоэлектроника: Успехи современ. радиоэлектроники. 1997. № 1; Полоса и критичность условий циклотронного авторезонанса (разам з А.А.Кураевым, А.У.Шчарбаковым) // Радиотехника и электроника. 1999. Т. 44, № 7.

СІНІ́ЧКІН Фёдар Міхайлавіч (27.12.1901, с. Гаўрылаўка Аляксееўскага р-на Самарскай вобл., Расія — 17.7.1962), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Баранавіцкай вобл., Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Ленінградскую пях. школу (1928), курсы ўдасканалення каманднага саставу (1935). У Чырв. Арміі з 1919. У Вял. Айч. вайну ў тыле праціўніка ў жн. 1941 арганізаваў партыз. групу ў Налібоцкай пушчы, з снеж. 1942 камандзір партыз. брыгады Ленінскай, у чэрв.—кастр. 1943 — партыз. брыгады імя С.М.Кірава. З 1945 на сав. рабоце.

СІ́НІЯ ВО́ДЫ, Сіняя Вада, Сінюха, левы прыток Паўд. Буга ў Кіраваградскай і Мікалаеўскай абл. Украіны. Даўж. 111 км, пл. басейна 16 725 км^2. На беразе С.В. у 1362 войска вял. кн. ВКЛ Альгерда разбіла мангола-татар. Гл. *Бітва каля Сініх Вод 1362.*

СІНКАНСЭ́Н, сістэма хуткасных чыг. магістралей у Японіі (Токіо—Кагосіма—Аомары—Сіманасекі). Мае двухкалейныя чыг. лініі даўж. 7 тыс. км. Макс. скорасць руху 250 км/гадз.

СІНКЕ́ВІЦКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1942, баі партыз. атрадаў па адначасовым разгроме варожага гарнізона ў вёсцы і на чыг. ст. Сінкевічы Ленінскага р-на Пінскай вобл. 30 кастр. ў Вял. Айч. вайну. План аперацыі з мэтай зрыву руху паяздоў па чыгункі Брэст—Гомель распрацаваў штаб Пінскага партыз. злучэння. Гарнізон і станцыя (больш за 100 гітлераўцаў) былі ўмацаваны дзотамі, узброены станковымі і ручнымі кулямётамі. Аперацыю праводзілі партыз. атрады імя М.Шыша (камандзір М.І.Герасімаў) і «Пятровіча» (А.П.Савіцкі). Групы прыкрыцця вывелі са строю тэлеф.-тэлегр. лінію сувязі, грунтавыя дарогі і чыгунку на падыходах. На досвітку ўдарныя групы разграмілі ў вёсцы паліцэйскі ўчастак, камендатуру, на станцыі падпалілі састаў з боепрыпасамі, ад узрываў якога былі знішчаны станцыйныя пабудовы і чыг. палатно. У ходзе гадзіннага бою падарваны 3 чыг. і 4 масты на грунтавых дарогах, знішчана 3 км тэлеф.-тэлегр. лініі сувязі, спалены лесапільны і малочны з-ды, будынкі акупац. улад, на працяглы час спынены рух на чыгунцы.

Літ.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990.

Сінкевіцкая Георгіеўская царква.

СІНКЕ́ВІЦКАЯ ГЕО́РГІЕЎСКАЯ ЦАРКВА́, помнік драўлянага дойлідства ў в. Сінкевічы Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл. Пабудавана ў 18 ст. на могілках. Царква — трохзрубная з прамавугольнымі ў плане аб'ёмамі роўнай вышыні. Цэнтр. зруб асн. аб'ёму завершаны невысокім чацверыком, накрыты 4-схільным шатром (знутры 8-схільным). Апсіда і бабінец пад вальмавымі дахамі з невял. гранёнымі галоўкамі. На адной восі з царквой пастаўлена зрубна-каркасная званіца; звонку 2-ярусная, мае схаваны прамежкавы ярус, накрыта 4-схільным шатром. У 1978—80 сцены будынкаў вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі і аздоблены падзорам.

Ю.А.Якімовіч.

СІНКЕ́ВІЧЫ, вёска ў Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл., на левым беразе р. Лань, на аўтадарозе Лунінец—Мікашэвічы; чыг. ст. на лініі Брэст—Гомель. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 36 км на У ад г. Лунінец, 276 км ад Брэста. 960 ж., 312 двароў (2001). З-д «Палімер», ляснічтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнікі падпольшчыкам і землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. 30.10.1942 у Вял. Айч. вайну ў вёсцы і на чыг. станцыі партызаны правялі *Сінкевіцкую аперацыю 1942.* Помнік архітэктуры — *Сінкевіцкая Георгіеўская царква.*

СІ́НКЛЕР (Sinclair) Эптан Біл (20.9.1878, г. Балтымар, ЗША — 26.11.1968), амерыканскі пісьменнік. Вучыўся ў Калумбійскім ун-це (Нью-Йорк). З 1920 займаўся выдавецкай дзейнасцю. Удзельнік літ. руху «макрэйкераў» («разграбальнікі бруду»), якія імкнуліся да выкрыцця грамадскіх заганаў, карупцыі ва ўсіх сферах жыцця. Дэбютаваў раманам «Кароль Мідас» (1901). Найб. значны твор — «сацыялагічны» раман «Джунглі» (1905) пра трагічныя лёсы рабочых. Аўтар раманаў «Сталіца» (1908), «Сільвія» (1913), «Кароль Вугаль» (1917), «Джымі Хігінс» (1919), «100%. Біяграфія патрыёта» (1920), «Нафта» (1927), «Бостан» (1928), «Аўтамабільны кароль» (1937), цыкла публіцыст. кніг «Мёртвая рука» (1918—25), кн. мемуараў «Аўтабіяграфія» (1962), эпапеі пра Лані Бэда (т. 1—11, 1940—53), шматлікіх аповесцей, апавяданняў, п'ес, кінасцэнарыяў і інш. Яго творы ўключаюць дакладныя факты, сацыялагічныя і гіст. дакументы; яны адметныя вастрынёй маральна-этычных канфліктаў, зваротам да эстэтыкі натуралізму ў спалучэнні з рэалізмам, свядомай тэндэнцыйнасцю, надзённасцю сюжэтаў, выразнай публіцыстычнасцю.

Тв.: Бел. пер. — Злодзей: П'еса. Мн., 1930; Аўтамабільны кароль: Аповесць аб фордаўскай Амерыцы. Мн., 1939; Рус. пер. — Джунгли. М., 1956; Джимми Хиггинс. М., 1957; 100%. Биография патриота. М.,1957; Столица.

М., 1957; Король Уголь. Донецк, 1981; Дельцы; Автомобильный король. М., 1986; Сильвия; Замужество Сильвии. СПб., 1992.

Літ.: Богословский В.Н. Эптон Синклер. М., 1976. *Е.А.Лявонава.*

СІНКЛІНА́ЛЬ (ад грэч. synclinō нахіляюся), сінклінальная складка, увагнутая складка пластоў горных парод, з нахілам слаёў да восі (замка), з больш маладымі пародамі ў цэнтр. ч. (ядры). Адрозніваюць С. сіметрычныя і асіметрычныя, каробчатыя (з плоскім дном), кілепадобныя і інш. Авальныя С. наз. *брахісінкліналямі* або *мульдамі*, акруглыя — чашамі. С. звычайна спалучаюцца з выпуклымі выгінамі слаёў — *антыкліналямі*. На Беларусі С. вядомы ў розных гарызонтах, найлепш вывучаны ў дэвонскай саліноснай тоўшчы Прыпяцкага прагіну, дзе прадстаўлены складкамі даўж. 4—25 км, шыр. 1,5—8 км. Гл. таксама *Складкі* горных парод. *І.В.Клімовіч.*

СІНКЛІНО́РЫЙ (ад *сінкліналь* + грэч. oros гара), комплекс складкавых дыслакацый слаёў зямной кары з агульнай сінклінальнай будовай, дзе люстэрка складкавасці (датычная паверхня да скляненняў або замкоў *антыкліналей*) апушчана ў гал. восевай ч. структуры. Даўжыня — многія сотні кіламетраў, шырыня — дзесяткі, радзей больш за 100 км. Пашыраны ў складкавых збудаваннях і ўтвараюцца на месцы *геасінкліналей* або арагенных (міжгорных) прагінаў. Чаргуюцца з *антыклінорыямі*. Тыповыя С. — Залаірскі на Урале, Новарасійскі на Каўказе. *І.В.Клімовіч.*

СІНКЛІ́Т (ад грэч. synklētos скліканы савет), 1) у Старажытнай Грэцыі сход вышэйшых саноўнікаў (савет). 2) У пераносным сэнсе (звычайна іранічна) поўны склад асоб (часцей высокапастаўленых).

СІНКО́ПА (грэч. synkopē літар. — абсяканне, скарачэнне), 1) у музыцы — зрушэнне акцэнта з метрычна больш моцнай долі такта на больш слабую. Абазначае зрухі націску, якія адбываюцца ў выніку несупадзення рэальнай і метрычнай акцэнтуацыі і прыводзяць да ўтварэння ў межах такта нарматыўных і ненарматыўных акцэнтаў. Асн. выразная якасць С. — абвастрэнне рытмічнага і меладычнага руху, актывізацыя метрычнай пульсацыі ці яе згладжванне. Сінкапіраваныя рытмы пашыраны ў прафес. і нар. музыцы многіх народаў свету, у т.л. беларусаў. Як характэрная адзнака ўласна муз. і выканальніцкага стылю С. ўласціва танц.-інстр. фальклору.

2) У вершаскладанні — пропуск галоснага гука або групы гукаў у сярэдзіне слова. Выкарыстоўваецца з мэтай дасягнення гукавой і сэнсава-эмацыянальнай выразнасці паэтычнага твора. Сустракаецца ў нар. творчасці, творах пісьмовай л-ры:

Стары дзед мяжой ішоў,
Залатыя ключы найшоў.
— Прападайце, **златы** ключы, —
За старога не йсці.

(Бел. народная песня)

Т.Б.Варфаламеева (музыка), *А.А.Майсейчык* (вершаскладанне).

СІНО́Д (ад грэч. synodos сход), сход вышэйшых духоўных асоб у хрысц. царкве. У 1721—1917 Свяцейшы Усерас. С. — вышэйшы орган кіравання ў *Рускай праваслаўнай царкве* (РПЦ). Усталяваны вярх. самадзярж. уладай замест скасаванага патрыяршаства, падпарадкоўваўся імператару. Паводле рэгламента, у склад С. ўваходзіла 12 іерархаў царквы. Дзярж. нагляд над С. ажыццяўляў свецкі чыноўнік, прызначаны імператарам, — обер-пракурор. Праз яго падтрымліваліся ўсе сувязі С. з дзярж. органамі. Пасля аднаўлення патрыяршаства (1917) С. у РПЦ дзейнічае як царк. дарадчы орган пры патрыярху Маскоўскім і ўсяе Русі. У наш час у склад С. ўваходзяць пастаянныя члены: мітрапаліт кіеўскі і ўсяе Украіны, мітрапаліт мінскі і слуцкі, патрыяршы экзарх усяе Беларусі, мітрапаліт санкт-пецярбургскі і ладажскі, мітрапаліт круціцкі і каломенскі, старшыня аддзела знешніх царк. зносін, кіраўнік спраў Маскоўскай патрыярхіі; і часовыя члены — епархіяльныя архірэі, якія па чарзе ўдзельнічаюць у рабоце С. На Беларусі з усталяваннем у 1989 Бел. экзархата дзейнічае *Сінод Беларускай праваслаўнай царквы*. У інш. правасл. цэрквах таксама існуюць С. з рознымі функцыямі. У каталіцкай царкве з 1960-х г. дзейнічае С. біскупаў як орган пры папе рымскім. С. на чале з патрыярхамі ёсць і ў некат. усх. цэрквах ва уніі з Ватыканам — копцкага, халдзейскага і інш. абрадаў. У пратэстантызме С. — сход духоўных і свецкіх асоб, які перыядычна склікаецца для прыняцця рашэнняў па рэліг. справах. *Г.М.Шэйкін.*

СІНО́Д БЕЛАРУ́СКАЙ ПРАВАСЛА́ЎНАЙ ЦАРКВЫ́, сход вышэйшых духоўных асоб у *Беларускай праваслаўнай царкве*. Дзейнічае з усталяваннем у 1989 Беларускага *экзархата*. Яму належыць вышэйшая царк. заканад., выканаўчая і суд. ўлада ў межах экзархата. Складаецца з 5 (4 часовыя і 1 пастаянны экзарх) членаў і 10 кіруючых архірэяў Бел. правасл. царквы. Часовыя члены па чарзе выклікаюцца на пасяджэнні, якія праводзяцца не радзей як 4 разы за год. Сінод дзейнічае ў межах кампетэнцыі, вызначанай царк. канонамі і Статутам Бел. экзархата. Падсправаздачны Сіноду Рускай правасл. царквы. *Г.М.Шэйкін.*

СІНО́НІМАЎ СЛО́ЎНІК, тып лінгвістычнага *слоўніка*, што змяшчае рады *сінонімаў* з тлумачэннямі і ілюстрацыйным матэрыялам, які пацвярджае правільнасць ужывання сінонімаў з іх тонкімі сэнсавымі і стылістычнымі адценнямі.

Задача С.с. — вылучэнне і апісанне часткі лексікі, звязанай паміж сабой сінанімічнымі адносінамі. Кожны сінанімічны рад у С.с. складае асобны артыкул. Размяшчаюцца артыкулы па алфавіце загалоўных (апорных) слоў, якімі пачынаюцца сінанімічныя рады. Першыя С.с. ва ўсх.-слав. народаў з'явіліся ў канцы 18 — пач. 19 ст. Найб. раннія з іх — «Спроба расійскага саслоўніка» Дз.І.Фанвізіна (1783; 32 сінанімічныя рады) і «Спроба слоўніка рускіх сінонімаў» П.Ф.Калайдовіча (1818; 77 сінанімічных радоў).

У бел. філалогіі ўпершыню створаны «Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў» М.К.Клышкам (1976, 2-е выд. 1993). Ахоплівае каля 1900 сінанімічных радоў (больш за 11 тыс. слоў сучаснай бел. мовы). Асаблівасць яго: не вызначае сэнсавых адценняў, уласцівых словам сінанімічных радоў, а абмяжоўваецца прывядзеннем да кожнага з іх прыкладаў з маст. л-ры, фальклору, перыяд. друку. У канцы слоўніка прыводзіцца індэкс (алфавітны паказальнік слоў, што ўваходзяць у сінанімічныя рады). *М.Р.Судзік.*

СІНО́НІМЫ (ад грэч. synōnymos аднайменны), блізказначныя словы адной часціны мовы і выразы, якія адрозніваюцца адценнямі значэння або стылістычнай афарбоўкай. Гл. *Сінанімія.*

СІНО́П (Sinop), горад на Пн Турцыі. Адм. ц. аднайм. іля. Каля 20 тыс. ж. (2001). Вузел аўтадарог, порт на Чорным моры. Прам-сць лесапільная і харчовая. Рамёствы, у т.л. саматужны выраб ільняных тканін. Цэнтр рыбалоўства.

Засн. не пазней 7 ст. да н.э. як калонія г. *Мілет*. У старажытнасці наз. Сінопа. Важны гандл. і рамесны цэнтр у Паўд. Прычарнамор'і. У 6 ст. да н.э. — 3 ст. н.э. чаканіў сваю манету. Да 4 ст. да н.э. знаходзіўся ў залежнасці ад *Ахеменідаў дзяржавы*, аднак меў унутр. самастойнасць. З 183 да н.э. ўваходзіў у *Пантыйскае царства* (напачатку як рэзідэнцыя цара, потым — сталіца). У 70 да н.э. заваяваны рым. палкаводцам Лукулам. З канца 4 ст. н.э. належаў Візантыі. Пасля ўтварэння Трапезундскай імперыі (1204) С. у яе складзе, у 1214—1307 у Канійскім султанаце. У канцы 14 ст. горад захапіў тур. султан *Баязід I*, у пач. 15 ст. — *Цімур*. У сярэдзіне 15 ст. далучаны да Асманскай імперыі. У 1853 у бухце С. адбылася бітва паміж рас. і тур. флатамі (гл. *Сінопская бітва 1853*). У С. нарадзіўся прадстаўнік філас. школы *кінікаў* Дыяген.

СІНО́ПЕ, спадарожнік планеты *Юпітэр*. Адлегласць ад планеты 23,7 млн. км, дыяметр каля 30 км. Сідэрычны перыяд абарачэння 758 сут. Адкрыты С.Нікалсанам (ЗША, 1914).

СІНО́ПСІС (ад грэч. synopsis агляд), 1) (устарэлае) збор розных поглядаў па якім-н. пытанні. 2) Зборнік звестак, нататак, артыкулаў па якім-н. пытанні, часцей размешчаных храналагічна; збор урыўкаў ці скарочаны выклад рэліг. твораў, тлумачэнняў Свяшчэннага пісання і інш.

«СІНО́ПСІС», 1) гісторыка-паліт. твор, выдадзены ў друкарні Святадухаўскага брацтва ў Вільні ў 1632. Выданне прымеркавана да сейма 1632, апісвае гіст., царк.-рэліг. і паліт. падзеі ў стараж.-рус. дзяржаве і ў ВКЛ з міфічных часоў да 1632. У 1632 брацтва выдала «Дадатак да «Сіно-

псіса» з новымі матэрыяламі па гісторыі рэлігійнай уніі, Святадухаўскага брацтва, правасл. царквы канца 16 — пач. 17 ст. 2) Гіст. твор, выдадзены ў друкарні Кіева-Пячэрскай лаўры ў 1674. Не раз быў перадрукаваны ў 17 і 18 ст. У ім апісаны гіст. сувязі ўсх.-слав. народаў, іх супольная барацьба супраць ворагаў, абгрунтавана неабходнасць уз'яднання Украіны з Расіяй. У «С.» выкарыстаны рус. летапісы, хронікі М.Стрыйкоўскага, Ф.Сафановіча і інш. гіст. крыніцы.

Г.Я.Галенчанка.

СІНО́ПСКАЯ БІ́ТВА 1853, марская бітва паміж рас. і тур. эскадрамі 18 ліст. ў бухце г.*Сіноп* (на паўн. узбярэжжы Турцыі) у час *Крымскай вайны 1853—56*; апошняя вял. бітва эпохі паруснага флоту. Тур. эскадра пад камандаваннем Асман-пашы стаяла на рэйдзе і рыхтавалася да высадкі дэсанта ў р-не Сухум-Кале (Сухумі) і Поці (16 караблёў розных класаў, узброеных 510 гарматамі), знаходзілася пад аховай берагавых батарэй. Рас. эскадра пад камандаваннем віцэ-адм. П.С.*Нахімава* (6 лінейных караблёў, 2 фрэгаты, 720 гармат) заблакіравала тур. эскадру з боку мора, вытрымала абстрэлы тур. берагавой і карабельнай артылерыі, прарвалася на Сінопскі рэйд і адкрыла агонь па тур. караблях і берагавых батарэях. За 4 гадзіны бою знішчана 15 тур. караблёў (адзін уцёк) і большасць берагавых батарэй. Страты тур. боку — больш за 3 тыс. чал. забітымі, каля 200 чал., у т.л. паранены Асман-паша, трапілі ў палон. Рас. эскадра страціла 37 чал. забітымі і 235 параненымі. У сувязі з гэтым паражэннем Турцыі яе саюзнікі — Вялікабрытанія і Францыя ў снеж. 1853 накіравалі свае эскадры ў Чорнае мора.

Да арт. **Сінопская бітва 1853**. Сінопская бітва 18 лістапада 1853. Мастак А.Багалюбаў. 2-я пал. 19 ст.

СІНО́ПТЫКА (ад грэч. synoptikos здольны ахапіць вокам), раздзел *метэаралогіі*, які вывучае працэсы фарміравання надвор'я з мэтай яго прагназіравання. Гл. таксама *Сінаптычная метэаралогія*, *Сінаптычныя карты*.

СІНТА́ГМА (ад грэч. syntagma разам пабудаванае, злучанае), 1) спалучэнне па пэўнай мадэлі дзвюх або болей моўных адзінак у патоку маўлення (*сінтагматыцы*): марфем («пера-езд», «вязуць»), слоў («ідзе дождж», «спявае песню», «дзеля жыцця»), сказаў («Ён сказаў, што думаў».). 2) Рытміка-інтанацыйная адзінка маўлення або маўленчы такт, што звычайна супадае з адрэзкам выказвання, які вымаўляецца без паўз, адным штурхком паветра, мае свой інтанацыйна-націскны цэнтр (сінтагматычны націск) і характарызуецца адноснай сэнсавай і сінтакс. цэласнасцю. Напр.: «Чыстая // глыбокая рэчка // ў люстраной паверхні сваёй // адбівае блакітнасць неба, // і ад гэтага здаецца яна // бяздоннай» (П.Галавач).

Літ.: Виноградов В.В. Понятие синтагмы в синтаксисе русского языка // Виноградов В.В. Избранные труды: Исслед. по рус. грамматике. М., 1975. *А.Я.Міхневіч.*

СІНТАГМА́ТЫКА, адзін з двух (разам з *парадыгматыкай*) сістэмна-структурных планаў арганізацыі мовы і аспектаў яе даследавання; сукупнасць заканамернасцей, што вызначаюць адносіны паміж адзінкамі ў патоку *маўлення*, у выказвальным ланцужку. Сінтагматычныя адносіны засн. на лінейнасці маўлення — абавязковай размеркаванасці яго ў часе; узнікаюць паміж адзінкамі аднаго ўзроўню (*фанемамі, марфемамі*, словаформамі, *сказамі*). Сінтагматычныя адносіны заўсёды наяўныя ў маўленні і проціпастаўляюцца адносінам парадыгматычным, што існуюць у моўнай свядомасці носьбіта мовы ў выглядзе асацыятыўных груповак адзінак (або парадыгматычных класаў), з якіх робіцца выбар адной з іх для ўключэння ў сінтагматычны ланцужок — выказванне адпаведнай структуры. *А.Я.Міхневіч.*

СІНТАІ́ЗМ (ад яп. сінта літар. — шлях багоў), нацыянальная рэлігія Японіі, якая склалася на аснове стараж. політэістычных вераванняў жыхароў яп. астравоў не менш як 2000 г. назад. Тэрмін «С.» выкарыстоўваецца з канца 6 — пач. 7 ст. н.э., каб адрозніваць уласна яп. рэліг. традыцыю ад распаўсюджаных у Японіі будызму і канфуцыянства. У С. няма заснавальніка, свяшчэнных кананічных тэкстаў, распрацаванага веравучэння. У яго аснове — вера ў існаванне шматлікіх нябачных божастваў (камі), абагаўленне прыроды, культ. продкаў. Лічыцца, што божастваў-камі існуе каля 8 млн. і яны нябачна жывуць паўсюдна побач з людзьмі. Да іх адносяцца духі рэк, азёр, гор, далін, дрэў, камянёў, боскія продкі яп. народа, божествы-ахоўнікі асобных мясцовасцей і рамёстваў, душы памерлых імператараў, знакамітых военачальнікаў, пісьменнікаў, вучоных і інш. Сінтаісцкі пантэон узначальвае багіня Сонца, родапачынальніца імператарскага роду *Аматэрасу* — дачка першай боскай пары *Ідзанакі і Ідзанамі* (Нябесны Бацька і Зямная Маці), якія стварылі Яп. астравы і ўсіх багоў. Гал. сінтаісцкае свяцілішча — храм Аматэрасу ў г. Ісе. Вернікі не павінны штодзённа наведваць храмы і маліцца багам; дастаткова ўдзельнічаць у гал. святах і рабіць прынашэнні на выкананне некат. рэліг. абрадаў і рытуалаў. Важную ролю ў абраднасці С. адыгрывае рытуал ачышчэння чалавека, які найчасцей зводзіцца да сімвалічнага ачышчэння вадой твару і рук перад уступленнем чалавека ў храм. Перад уваходам у храм знаходзяцца вароты (торыі), якія сімвалізуюць пераход чалавека з паўсядзённай прасторы ў сакральную (свяшчэнную) зону. Людзі ўносяць у храм грашовыя ахвяраванні, ускладаюць для камі ахвярапрынашэнні (звычайна ў выглядзе страў, напіткаў) і ўзносяць да камі маўклівую малітву; набываюць там разнастайныя амулеты і талісманы. Асн. змест малітваў у С. — просьба да камі пра дапамогу, абарону ці выяўленне ўдзячнасці. Звычайна абрады, звязаныя з нараджэннем і шлюбам, праводзяцца ў адпаведнасці з сінтаісцкім рытуалам, а пахавальныя — з будысцкім. Важную ролю ў С. адыгрываюць святы ўраджаю, сустрэчы Новага года, святкаванні, прысвечаныя камі-ахоўнікам пэўных родаў і тэрыторый; ушаноўваюцца таксама імператар і яго боскія продкі. Часам японцы робяць паломніцтва да свяшчэнных гор, вадаспадаў і там выконваюць адпаведныя рэліг. рытуалы. У Японіі больш за 80 тыс. сінтаісцкіх свяцілішчаў. Памаліцца божествам і прынесці ім сімвалічныя ахвяры можна і перад хатнім алтаром (камідана). Свяшчэннаслужыцелямі мо-

гуць быць і мужчыны, і жанчыны. У студз. 1946 выдадзены імператарскі эдыкт, паводле якога імператар адракаўся ад свайго боскага паходжання і абвяшчаў, што адносіны паміж тронам і народам трымаюцца выключна на ўзаемных даверы і любові. Існуе таксама сектанцкі С. (больш за 10 сектаў).

Літ.: Светлов Г.Е. Путь богов: (синто в истории Японии). М., 1985; Синтоизм и конфуцианство. М., 1994; Религиозные традиции мира: Пер. с англ. М., 1996. Т. 2. С. 491—610; Народы и религии мира: Энцикл. М., 1999; Накорчевский А.А. Синто. СПб., 2000; Japan: Profile of a Nation. Tokyo etc., 1994.

Э.С.Дубянецкі.

СІ́НТАКСІС (ад грэч. syntaxis пабудова, парадак), 1) уласцівыя пэўнай мове спосабы спалучэння форм *слоў* у *словазлучэнні* і *сказы*, простых сказаў у складаныя, а таксама значэнні, функцыі і тыпы словазлучэнняў і сказаў. 2) Раздзел *граматыкі*, які вывучае заканамернасці пабудовы сказаў і моўныя катэгорыі, звязаныя са сказам. Аб'ект сінтакс. вывучэння і апісання — працэс і вынікі моўнай намінацыі сітуацый з мэтай зносін. Асн. катэгорыі С. — слова (словаформа), словазлучэнне, сказ, *выказванне*, сінтакс. сувязі. Найважнейшая ў С. катэгорыя — *прэдыкатыўнасць*, а таксама *інтанацыя* выказвання. Аб'ект С. шматгранны, таму ў межах сінтакс. вывучэння мовы суіснуюць розныя кірункі: С. часцін мовы і членаў сказа, С. словазлучэння і сказа, С. актуальнага члянення і тэксту, С. мадэляў сказа і іх парадыгматыкі і інш. Найб. значныя і актуальныя кірункі С.: статычны вызначае ўласцівыя пэўнай мове сукупнасці сінтакс. структур, г.зн. тыпаў словазлучэнняў (адзінак непрэдыкатыўных) і сказаў (адзінак прэдыкатыўных), а таксама іх агульных значэнняў; дынамічны (камунікатыўны) вывучае суадносіны і выкарыстанне сінтакс. структуры ў маўленчай дзейнасці, працэсы (перабудова сінтакс. сувязей, вызначэнне парадку слоў, акрэсленне інтанацыі, афармленне актуальнага члянення і г.д.), што суправаджаюць пераўтварэнне сказа як адзінкі моўнай сістэмы ў выказванне — адзінку маўлення; функцыянальна-семантычны накіраваны на высвятленне ўзаемадзеяння семантыкі і функцыі моўных адзінак у выказванні. Істотнымі кірункамі даследавання і апісання мовы і маўлення з'яўляюцца таксама С. тэксту, стылістычны С., гіст. С. і інш.

Літ.: Граматыка беларускай мовы. Т. 2. Сінтаксіс. Мн., 1966; Міхневіч А.Я. Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы. Мн., 1976; Беларуская граматыка. Ч. 2. Сінтаксіс. Мн., 1986.

А.Я.Міхневіч.

СІ́НТЭЗ (ад грэч. synthesis злучэнне, спалучэнне, састаўленне), 1) злучэнне, спалучэнне розных элементаў, бакоў прадмета ў адно цэлае (*сістэму*), якое ажыццяўляецца і ў практычнай дзейнасці, і ў працэсе пазнання. С. процілеглы *аналізу*, але непарыўна з ім звязаны. 2) Метад навук. даследавання якога-н. прадмета, з'явы, які ў працэсе даследавання пазнаецца цалкам, у адзінстве і ўзаемасувязі ўсіх яго частак. 3) У філасофіі Г.Гегеля — найвышэйшая ступень развіцця, якая вырашае супярэчнасці папярэдніх ступеняў. 4) У псіхалогіі — мысліцельная аперацыя, якая зводзіцца да аб'яднання прадметаў, што адлюстроўваюцца, у адно цэлае. Разам з аналізам забяспечвае фарміраванне паняццяў і працэс мыслення. 5) С. сацыяльны — спалучэнне і злучэнне асобных элементаў, індывідаў або груп у арганізаваную сістэму адносін для дасягнення ўзаемных мэт.

СІ́НТЭЗ МАСТА́ЦТВАЎ, спалучэнне розных мастацтваў ці відаў мастацтва ў адзінае маст. цэлае, якое вобразна арганізуе матэрыяльнае і духоўнае асяроддзе чалавека. У выніку С.м. узнікае якасна новае ўтварэнне, якое вызначаецца эстэт. раўнавагай і ўзаемадзеяннем усіх кампанентаў. Найчасцей выкарыстоўваецца арх.-маст. сінтэз; у ім удзельнічаюць *манументальнае мастацтва* (скульптура, жывапіс), *архітэктура малых форм, садова-паркавае мастацтва, ландшафтная архітэктура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва* і інш. Некат. віды і жанры мастацтва існуюць толькі пры ўмове сінтэзу: драм. і оперны т-ры, цырк, кіно, тэлебачанне, эстрада — яны аб'ядноўваюць творчасць драматурга (сцэнарыста), акцёра, рэжысёра, мастака, аператара (у кіно), кампазітара; у муз. т-ры драм. мастацтва знаходзіцца ў адзінстве з вак. і інстр. музыкай, харэаграфіяй, сцэнаграфіяй і інш. (гл. *Кінамастацтва, Тэатр*). У аб'яднанні кампанентаў мастацтва т-ра ці кінатвора вял. роля належыць *рэжысёрскаму мастацтву*. Сінтэз часавых мастацтваў (паэзія, музыка) ажыццяўляецца ва ўсіх жанрах вак. і вак.-тэатр. музыкі (песня, раманс, опера, кантата і інш.). Сінтэз л-ры і выяўл. мастацтва выяўляецца ў *кніжнай графіцы, мастацтве кнігі*. Розныя эпохі і перыяды сусв. культуры пакінулі шэдэўры гарманічнага С.м. (напр., спалучэнне архітэктуры і скульптуры грэч. акропаляў і храмаў, скульптуры і размалёвак рым. форумаў і палацаў; напаўненне храмавай прасторы абразамі, фрэскамі, мазаікай, вітражамі і інш.). Яркі С.м. праявіўся ў маст. творах стылю *мадэрн*. С.м. стаў асновай узнікнення новых відаў мастацтва — *інвайрэнмент, перформанс, лэнд-арт, хэпенінг, відэакліп* і інш.

Літ.: Искусство и быт. Вып. 4. Синтез искусств и архитектура общественных зданий. М., 1974; Салеев В.А. Искусство и его оценка. Мн., 1977; Взаимодействие и синтез искусств. Л., 1978; Зись А. Виды искусства. М., 1979; Массовые виды искусства и современная художественная культура. М., 1986; Устюгова Е.Н. Стиль как явление культуры. СПб., 1994; Махлина С.Т. Язык искусства в контексте культуры. СПб., 1995; Ильин И.П. Постструктурализм. Деконструктивизм. Постмодернизм. М., 1996.

В.А.Салееў, Я.Ф.Шунейка.

СІ́НТЭЗ МЕХАНІ́ЗМАЎ, раздзел *механізмаў і машын тэорыі*, у якім вывучаюцца метады праектавання кінематычных схем механізмаў па іх зададзеных кінематычных і мех. уласцівасцях. Найб. выкарыстоўваецца метад кінематычнага С.м. — вызначэнне кінематычных схем механізмаў (кулачковых, рычажных, шарнірных і інш.) і іх параметраў, што забяспечваюць неабходныя рухі.

СІ́НТЭЗ МІНЕРА́ЛАЎ, штучнае атрыманне мінералаў і монакрышталёў; адзін з раздзелаў эксперымент. *мінералогіі*. Ажыццяўляецца рознымі метадамі з аднакампанентных і многакампанентных сістэм. Крышталізацыя з расплаву — найб. пашыраны працэс прамысл. вырошчвання крышталёў і мінер. злучэнняў: карунд і яго разнавіднасці, рутыл, фабуліт, шпінэлі, флюарыт, александрыт, гранаты і інш. Крышталізацыя з насычаных растворaў адбываецца пры т-рах 30—600 °С — з водных растворaў (гідратэрмальны метад), 600—1400 °С — з солевых і інш. растворaў-расплаваў пры розных цісках (напр., пры сінтэзе алмазаў некалькі гігапаскаляў). Гэтым метадам атрымліваюць кварц (зялёныя і блакітныя крышталі, аметыст, цытрын), кальцыт, берлініт, цынкіт, карунд і яго разнавіднасці, сфалерыт, садаліт, кінавар і інш. Крышталізацыя з паравой (газавай) фазы адбываецца праз кандэнсацыю з малекулярных або плазменных пучкоў, катоднае або высокачастотнае распыленне, сінтэз у замкнёных аб'ёмах або ў патоку інертных газаў. Гэтым метадам вырабляюць галеніт, паратэлурыд і інш. Існуюць таксама метады хім. асаджэння з растворaў (напр., сінтэз апалу), цвёрдафазных рэакцый з прасаваннем пры высокіх цісках (напр., атрыманне бірузы, жадэіту). Гл. таксама *Мінералы штучныя*.

У.Я.Бардон.

СІ́НТЭЗ ХІМІ́ЧНЫ, мэтанакіраванае атрыманне хім. рэчываў з інш. (звычайна больш простых) рэчываў шляхам іх хім. ператварэнняў. С.х. *неарганічных злучэнняў* (неарган. сінтэз) і *арганічных злучэнняў* (арган. сінтэз) з'яўляецца асн. метадам атрымання індывід. хім. рэчываў. Ажыццяўляюць на прамысл. прадпрыемствах (гл. *Хімічная прамысловасць*) і ў навук. лабараторыях.

Прамысл. многатанажная вытв-сць арган. рэчываў наз. асноўным арганічным сінтэзам, прадуктамі якога з'яўляюцца нізкамалекулярныя злучэнні, у т.л. растваральнікі, манамеры для атрымання высокамалекулярных злучэнняў, фарбавальнікі. Малатанажная вытв-сць складаных арган. злучэнняў (лек. прэпаратаў, вітамінаў, хім. сродкаў аховы раслін і інш.) — тонкі арганічны сінтэз, заснаваны на паслядоўным ажыццяўленні некалькіх (часам дзесяткаў) хім. ператварэнняў (стадый сінтэзу) з вылучэннем і ачысткай прамежкавых рэчываў. Неарган. сінтэзам у прамысл. маштабах атрымліваюць мінер. к-ты (азотную, серную, фосфарную, саляную), асновы (аміяк, гідраксіды), некат. солі металаў. Асн. па-

казчык рацыянальнасці прамысл. С.х. — найб. эфектыўнасць вытв-сці пры мінім. экалагічнай шкодзе і найменшых сыравінных, энергет., працоўных і фін. затратах. Гэтаму спрыяе ажыццяўленне С.х. ва ўмовах, што прыводзяць да паскарэння *рэакцый хімічных*, павышэння іх выбіральнасці. Лабараторны С.х. значна ўплывае на развіццё хім. навукі, дазваляе атрымліваць новыя злучэнні, з'яўляецца найважн. крытэрыем правільнасці вызначэння будовы прыродных і інш. злучэнняў складанай структуры. У 1828 Ф.*Вёлер* ажыццявіў сінтэз арган. рэчыва — мачавіны з неарган. цыяніду амонію, што лічыцца пачаткам арган. сінтэзу. Найб. значныя вехі яго развіцця — сінтэзы воцатнай к-ты (Г.Кольбе; 1845), камфоры (Компа; 1889), глюкозы (Э.Фішэр; 1890), трапінону (Р.Робінсан; 1917), геміну (Г.Фішэр; 1929), хларафілу (Р.Вудвард; 1960), гена аланінавай т-РНК (Х.Карана; 1970), вітаміну B_{12} (Вудвард; 1971), палітаксіну (І.Кішы; 1994), брэветаксіну (К.С.Нікалаоу; 1997). У 1960-я г. амер. хімік Э.Кары распрацаваў прынцыпы планавання сінтэзу злучэнняў складанай структуры — рэтрасінт. аналіз, заснаваны на ўяўным раздзяленні паводле пэўных правіл мэтавай малекулы на больш простыя фрагменты, якім адпавядаюць рэчывы, здольныя пры ўзаемадзеянні прывесці да пабудовы запланаванай малекулярнай структуры. Сучасны стан арган. сінтэзу характарызуецца шырокім выкарыстаннем спектральных (ядзерны магн. рэзананс, інфрачырв. і ультрафіялетавая спектраскапія) і інш. фіз.-хім. метадаў аналізу і раздзялення хім. рэчываў (*дыстыляцыя, крышталізацыя, храматаграфія, мембранныя метады раздзялення* і інш.), многаварыянтнасцю сінт. метадаў, што робіць асабліва важным выкарыстанне хім. ператварэнняў, якія дазваляюць атрымліваць прадукты з пэўнай прасторавай арыентацыяй атамаў у малекуле з высокай выбіральнасцю.

На Беларусі многатанажны С.х. ажыццяўляецца на прадпрыемствах *Наваполацкага вытворчага аб'яднання «Палімір», Магілёўскага вытворчага аб'яднання «Хімвалакно», Гродзенскага вытворчага аб'яднання «Азот»*, на *Гомельскім хімічным заводзе*. Даследаванні па тонкім арган. сінтэзе праводзяцца ў Ін-це фізіка-арган. хіміі, Ін-це біяарган. хіміі Нац. АН Беларусі, БДУ і інш.

Літ.: Лебедев Н.Н. Химия и технология основного органического и нефтехимического синтеза. 4 изд. М., 1988; Бочков А.Ф., Смит В.А. Органический синтез. М., 1987; Руководство по неорганическому синтезу: Пер. с нем. Т. 1—6. М., 1985—86; Титце Л., Айхер Т. Препаративная органическая химия: Пер. с нем. М., 1999.

А.Р.Кулінковіч.

СІНТЭ́ЗАТАР, клавішны муз. інструмент. Гл. ў арт. *Электрамузычныя інструменты*.

СІНТЭ́ЗЫ, клас *ферментаў*, тое, што *лігазы*.

СІНТЭ́ТЫКА (ад грэч. synthetikos які аб'ядноўвае), сінтэтычныя матэрыялы, атрыманыя шляхам сінтэзу якіх-н. рэчываў, таксама назва вырабаў з іх.

СІНТЭТЫ́ЧНАЕ ВА́ДКАЕ ПА́ЛІВА, штучнае вадкае паліва, складаныя сумесі *вуглевадародаў*, атрыманыя з сыравіны нянафтавага паходжання. Вытв-сць С.в.п. ўзнікла ў пач. 20 ст. з-за адсутнасці ў некат. краінах радовішчаў нафты; развіваецца з прычыны абмежаванасці яе запасаў.

Атрымліваюць тэрмахім. раскладаннем цвёрдага паліва (бурых і кам. вугалёў, гаручых сланцаў) ці *газіфікацыяй паліва* з наступным каталітычным ператварэннем сінтэз-газу (сумесь аксіду вугляроду з вадародам). Найб. пашыраны спосаб тэрмахім. раскладання — *гідрагенізацыя*, якую ажыццяўляюць пры т-ры 400—500 °С і ціску вадароду да 70 МПа; звадкаванне адбываецца ў выніку дэструкцыі арган. масы паліва і наступнага гідравання прадуктаў, што ўтварыліся (выхад вадкіх прадуктаў — каля 80% ад арган. масы цвёрдага паліва). Гл. таксама *Паліва*.

СІНТЭТЫ́ЧНЫ ЎЛІК, улік па ўзбуйненых эканамічных паказчыках у грашовым выражэнні, які паказвае дынаміку руху ўсіх аб'ектаў *бухгалтарскага ўліку* ў абагульненых вартасных паказчыках. Вядзецца ў разрэзе сінт. *рахункаў бухгалтарскага ўліку*, адзіны план якіх зацвярджаецца ў цэнтралізаваным парадку. Служыць для атрымання сумарных звестак аб гасп.-фін. дзейнасці прадпрыемства, установы, арг-цыі. Дае магчымасць правяраць узаемасувязь усіх гасп. аперацый і шляхам зверкі сінт. і *аналітычнага ўліку* кантраляваць дасканаласць і правільнасць іх адлюстравання ва ўліку. С.ў. карыстаюцца пры складанні і праверцы справаздачнасці. На прадпрыемствах (аб'яднаннях) з дапамогай С.ў. вызначаюць агульную наяўнасць асн. сродкаў, сыравіны і матэрыялаў, затраты на вытв-сць, стан разлікаў з пастаўшчыкамі і г.д.; у фін.-крэдытных установах — кантралююць выкананне бюджэту і крэдытныя аперацыі.

СІНТЭТЫ́ЧНЫХ СМОЛ І ПЛАСТЫ́ЧНЫХ МАС ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна *хімічнай прамысловасці* па вырабе сінт. палімераў і пластмас. Базавая сыравіна для іх вытв-сці — вуглевадароды нафтаперапрацоўкі.

У 1872 у ЗША выраблены цэлулоід (пластмаса са штучнага палімера нітрату цэлюлозы). У 1906—10 у Расіі і Германіі наладжаны выпуск матэрыялаў на аснове фенола-фармальдэгіднай смалы, у 1930-я г. ў ЗША, Германіі, СССР і інш. — полівінілхларыду, поліамідаў, полістыролу. Шырокае развіццё прам-сці пачалося пасля 2-й сусв. вайны; з 1950-х г. выпускаецца поліэтылен.

На Беларусі станаўленне прам-сці адбылося ў 1960-я г., калі пачаў працаваць Полацкі хім. камбінат. У 1975 на яго базе створана *Наваполацкае вытворчае аб'яднанне «Палімір»*, дзе выпускаюць поліэтылен высокага ціску. Прадукцыя галіны вырабляецца на *Гродзенскім вытворчым аб'яднанні «Азот»* (капралактам), *Магілёўскім вытворчым аб'яднанні «Хімвалакно»* (дыметылтэрафталат, поліэтылентэрафталат), *Лідскім лакафарбавым заводзе* (алкідныя і поліэфірныя смолы, полівінілацэтатная дысперсія). Асн. спецыялізацыя галіны — вытв-сць палімераў для выпуску сінт. валокнаў, нітак, лакафарбавых матэрыялаў. У 1990 выраблена 751 тыс. т сінт. смол і пластмас (у т.л. 138 тыс. т поліэтылену), у 2000—480 тыс. т (у т.л. 109 тыс. т поліэтылену). *В.П.Сідоранка.*

СІНТЭТЫ́ЧНЫХ ФАРБАВА́ЛЬНІКАЎ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна *хімічнай прамысловасці* па вырабе сінт. *фарбавальнікаў* і прамежкавых прадуктаў для іх вытв-сці. Узнікла ў 1856, калі У.Г.*Перкін* атрымаў мавеін (анілінавы фарбавальнік) і арганізаваў яго прамысл. вытв-сць. Першапачаткова наз. анілінафарбавай. Найб. развіта ў ЗША, ФРГ, Японіі, Вялікабрытаніі.

Асн. сыравіна для вытв-сці фарбавальнікаў — араматычныя вуглевадароды, што атрымліваюць з каменнага вугалю і нафты — бензол, талуол, ксілолы, нафталін, антрацэн і інш., таксама неарган. злучэнні — кіслоты, шчолачы, солі і інш. Сінт. фарбавальнікі выкарыстоўваюцца для розных матэрыялаў (баваўны, лёну, хім. валокнаў, скуры, футра і інш.), а таксама ў кіна-, фотапрам-сці, медыцыне, аналітычнай хіміі, лазернай тэхніцы і інш. *В.П.Сідоранка.*

СІНТЭТЫ́ЧНЫЯ КРЫШТАЛІ́, крышталі, якія вырошчваюцца штучна ў лабараторных і заводскіх умовах. Маюць такую ж атамную будову, што і прыродныя крышталі, часта больш дасканалыя за іх паводле сваіх уласцівасцей. Аб'ёмныя і танкаплёначныя С.к. вырошчваюцца з газавай фазы, з раствораў і расплаваў (гл. *Крышталізацыя, Эпітаксія*). У прамысл. маштабах атрымліваюць С.к. п'еза- і сегнетаэлектрыкаў, паўправаднікоў, аптычных матэрыялаў і інш. Выкарыстоўваюцца ў якасці падложак у запамінальных прыстасаваннях, матэрыялаў для сцынтыляцыйных лічыльнікаў, штучных каштоўных камянёў і інш. Гл. таксама *Сінтэз мінералаў*.

СІНТЭТЫ́ЧНЫЯ МА́СЛЫ, вадкія арган. ці элементаарган. прадукты (*крэмнійарганічныя вадкасці*, эфіры фосфарнай, адыпінавай і інш. к-т, поліалкіленгліколі). Хімічна інертныя да металаў, гумы, фарбы і інш., малавыпаральныя; працаздольныя пры т-рах ад -100 да 400 °С. Выкарыстоўваюць змазачныя матэрыялы (гл. *Змазачнае масла*), цепланосьбіты, кампаненты пластычных змазак.

СІНТЭТЫ́ЧНЫЯ МО́ВЫ, мовы, у якіх граматычныя значэнні выражаюцца формамі слоў: афіксамі («чыта-ю», «з-рабіць», «мах-а-ць» — «мах-ну-ць»), унутр. флексіяй («з-бір-аць» — «са-бр-аць»), націскам («засыпаць» — «засыпа́ць»), суплетыўнымі формамі («я» — «мне»), а не службовымі словамі, парадкам слоў, інтанацыяй (як у *аналітычных мовах*). Да С.м. належаць бел., стараж.-грэч., лац., стараж.-слав., ням., літ. і інш. мовы. Сінтэтычныя спосабы часткова выкарыстоўваюць і аналітычныя мовы. Гл. таксама *Тыпалагічная класіфікацыя моў*.

Літ.: Теоретические основы классификации языков мира. М., 1980.

А.Я.Міхневіч.

СІНУ́ЗІЯ (ад грэч. synusia сумеснае знаходжанне, згуртаванне), прасторава і экалагічна адасобленая ч. расл. згуртавання (*фітацэнозу*), якая складаецца з відаў раслін адной або некалькіх экала-

гічна блізкіх *жыццёвых форм*. Паняцце «С». ўвёў ням. геабатанік Х.Гамс (1918), які з батанікамі швед. Э.Дзю Рые і эст. Т.Ліпмаа распрацавалі т.зв. метад С., згодна з якім С. — выходны аб'ект вывучэння расліннасці. С. адрозніваюцца ў марфал., фларыстычных, экалагічных і фітацэнатычных адносінах. У лясах умеранага пояса трапляюцца дзесяткі С., у т.л. ярусныя (дрэвы, кусты, кусцікі), эпіфітныя (лішайнікі, імхі, водарасці на ствалах), эпіфальныя (паразітычныя грыбы на лісці), эпіксільныя (грыбы на адмерлай драўніне), унутрыглебавыя (мікраарганізмы) і інш.

СІ́НУС, адна з *трыганаметрычных функцый*. Абазначэнне sin. С. вострага вугла ў прамавугольным трохвугольніку — адносіны катэта, які ляжыць насупраць гэтага вугла, да гіпатэнузы.

СІ́НУС (лац. sinus выгін, пазуха, выпукласць) у анатоміі, паглыбленне, упадзіна, выпукленне, расшырэнне, доўгі замкнуты канал. Бываюць ва ўнутр. органах і запоўненыя крывёй (напр. С. селязёнкі, С. аорты, вянозны С.), у касцях чэрапа запоўненыя паветрам (напр., пазухі носа, лобныя пазухі).

СІНУСАІДА́ЛЬНЫ ТОК, перыядычны *электрычны ток*, які зменьваецца паводле сінусоіднага закону. Гл. *Пераменны ток*.

СІНУСАІДА́ЛЬНЫЯ ВАГА́ННІ, ваганні, пры якіх змены вагальнай велічыні адбываюцца па сінусоідзе (касінусоідзе); тое, што *гарманічныя ваганні*.

СІНУСІ́Т, вострае або хранічнае запаленне слізістай абалонкі прыдаткавых пазух носа (напр., гайморавай — *гайморыт*). Развіваецца пры інфекцыях дыхальных шляхоў, пашкоджанні касцей чэрапа, карыесе і інш. Зрэдку бывае пансінусіт (пашкоджанне ўсіх пазух). Хранічны С. з утварэннем паліпаў і кіст бывае пры парушэнні адтоку запаленчага эксудату з пазухі носа пры вострым С., пры скрыўленні перагародкі носа і інш. Прыкметы: боль у вобласці вачніц, ілба і інш. частак галавы, дыханне праз нос абцяжарваецца. Лячэнне тэрапеўт., хірургічнае. *І.М.Семяненя.*

СІ́НУСНАЯ ЛІНЕ́ЙКА, інструмент для дакладнага вымярэння вуглоў, устаноўкі дэталей пад зададзеным вуглом, вымярэння лінейных параметраў кліноў, конусаў і інш. дэталей, вызначэння вуглоў нахілу паверхняў і інш. Вугал α вызначаецца з роўнасці $b=l\sin\alpha$. Для вымярэнняў выкарыстоўваюць *канцавыя меры* даўжыні, на якія ўстанаўліваюць адзін з ролікаў.

СІНХРАГЕНЕРА́ТАР, электронная прылада (*генератар*), якая выпрацоўвае імпульсы зададзенай формы і з пэўнымі часавымі зрухамі паміж імі. Выкарыстоўваецца ў тэлевізійнай апаратуры (на тэлецэнтрах) для фарміравання сінхранізавальных (радковых і кадравых) і тушыльных (для выключэння электроннага праменя на час адваротнага ходу разгорткі) імпульсаў кіравання работай прылад разгорткі відарысаў, а таксама ў апаратуры многаканальнай сувязі з часавым раздзяленнем каналаў.

СІНХРАНІЗА́ТАР, механізм ці прыстасаванне, што забяспечвае *сінхранізацыю* некалькіх машын, механізмаў, сістэм. У радыёлакатарах, тэлевізійнай і інш. апаратуры сувязі С. — электроннае прыстасаванне, што забяспечвае ўзгодненую па часе і фазе работу некалькіх прылад шляхам падачы на іх спец. кіравальных сінхрасігналаў. С. аўтамабільны — прыстасаванне для бясшумнага і безударнага ўключэння каробкі перадач. *В.І.Вараб'ёў.*

СІНХРАНІЗА́ЦЫЯ (ад грэч. synchronos адначасовы), прывядзенне некалькіх працэсаў да строгай узгодненасці іх працякання ў часе, у выпадку перыядычных працэсаў — забеспячэнне роўнасці (кратнасці) іх перыядаў ці супадзення фаз. Выконваецца *сінхранізатарамі*. Шырока выкарыстоўваецца ў энергетыцы, тэлебачанні, шматканальнай радыёсувязі, радыёлакацыі, сістэмах дакладнага вымярэння часу, выліч. тэхніцы і інш. Гл. таксама *Сінхрагенератар, Сінхранізацыя ваганняў*.

СІНХРАНІЗА́ЦЫЯ ВАГА́ННЯЎ, устанаўленне і падтрыманне рэжыму *ваганняў* дзвюх ці больш *вагальных сістэм*, пры якім іх частоты роўныя ці кратныя адна адной. Напр., С.в. адбываецца ў звязанай сістэме з 2 аўтавагальных сістэм з блізкімі частотамі — абедзве сістэмы вагаюцца з аднолькавай частатой.

Аўтагенератары, генератары пераменнага току, сінхронныя рухавікі і інш. нелінейныя сістэмы ў выніку С.в. уваходзяць у сінхронны рэжым і ўстойліва працуюць у межах вызначанай паласы частот, некалькі эл. генератараў могуць працаваць на агульную эл. сетку, некалькі радыёперадатчыкаў — на агульную антэну і інш. На С.в. заснавана работа памнажальнікаў і дзялільнікаў частаты і інш. С.в. выкарыстоўваецца і ў медыцыне, напр., пры парушэннях рытму работы сэрца хворым ужыўляюць электронны сінхранізатар сардэчнага рытму — кардыястымулятар.

СІНХРАНІ́Я (ад грэч. synchronos адначасовы), 1) стан мовы на пэўным этапе яе гіст. развіцця як цэласнай, унутрана ўстойлівай сістэмы фанетычных, лексічных і граматычных элементаў (гл. *Сістэма мовы*); перыяд у развіцці мовы, вылучаны ўмоўна паводле прыкметы адсутнасці ў ім змен ці іх неістотнасці. 2) Вывучэнне мовы як сістэмы адносін, што функцыянуе ў пэўны момант яе гіст. развіцця. Паслядоўнае размежаванне С. і *дыяхраніі* (а таксама самі гэтыя тэрміны) прапанаваны Ф. дэ *Сасюрам*.

Літ.: [Климов Г.А.] Проблема разграничения синхронии и диахронии // Общее языкознание: Методы лингвистич. исслед. М., 1973; Соссюр Ф. де. Курс общей лингвистики // Соссюр Ф. де. Труды по языкознанию: Пер. с фр. М., 1977. *А.Я.Міхневіч.*



Схема вымярэння **сінуснай лінейкай**: 1 — сінусная лінейка; 2 — дакладныя ролікі; 3 — канцавыя меры памерам b; α — вугал, які вымяраецца; *l* — адлегласць паміж восямі ролікаў.

СІНХРАТРО́Н [ад грэч. synchronos адначасовы + (*элек*)*трон*], цыклічны рэзанансны *паскаральнік зараджаных часціц* (у асн. электронаў). Паскарэнне электронаў адбываецца ў высокачастотным эл. полі, частата якога нязменная, і ў магн. полі, напружанасць якога змяняецца ў часе. Пры гэтым часціцы рухаюцца па арбіце пастаяннага радыуса. З-за страт энергіі на *сінхратроннае выпрамяненне* электроны ў С. паскараюцца да 10 ГэВ. Выкарыстоўваецца для атрымання пучкоў рэлятывісцкіх электронаў і пазітронаў, а таксама мяккага рэнтгенаўскага выпрамянення.

СІНХРАТРО́ННАЕ ВЫПРАМЯНЕ́ННЕ, выпрамяненне эл.-магн. хваль зараджанымі часціцамі, якія рухаюцца ў аднародным магн. полі з рэлятывісцкімі скарасцямі. Абумоўлена паскарэннем, звязаным са скрыўленнем траекторыі часціц (гл. *Лорэнца сіла*). Назіраецца ў *сінхратроне* (адсюль назва).

Характарызуецца шырокім дыяпазонам частот; мае эліптычную палярызацыю (гл. *Палярызацыя святла*) і шырокі неперарыўны спектр (гл. *Спектры аптычныя*) з максімумам у яго доўгахвалевай частцы. Найб. істотна для лёгкіх часціц. Страты энергіі электронаў на С.в. ўлічваюцца пры канструяванні сінхратронаў. Выпрамяненне звышновых зорак, квазараў, пульсараў і радыёгалактык мае сінхратронную прыроду. Вывучэнне інтэнсіўнасці і палярызацыі касм. С.в. дазваляе атрымаць інфармацыю аб канцэнтрацыі і энергет. спектры рэлятывісцкіх электронаў, велічыні і напрамку магн. поля ў аддаленых абласцях Сусвету. С.в. выкарыстоўваюць таксама пры вывучэнні структуры цвёрдага цела. *І.С.Сацункевіч.*

СІНХРАФАЗАТРО́Н (ад грэч. synchronos адначасовы + *фазатрон*), пратонны сінхратрон, цыклічны рэзанансны *паскаральнік зараджаных часціц* (у асн. пратонаў). Паскарэнне часціц у С. адбываецца ў высокачастотным эл. полі, частата якога змяняецца (у адрозненне ад *сінхратрона*) адначасова са зменамі напружанасці магн. поля так, каб радыус раўнаважнай арбіты часціц заставаўся нязменным. У кожным цыкле паскараецца да 10^{13} часціц. На Серпухаўскім С. (Расія) пратоны паскараюцца да энергіі 76 ГэВ; на тэватроне (С. са звышправоднымі магнітамі; ЗША) — да 1 ТэВ. Выкарыстоўваецца ў навук. даследаваннях па ядз. фізіцы і фізіцы элементарных часціц. *І.С.Сацункевіч.*

СІНХРАЦЫКЛАТРО́Н, тое, што *фазатрон*.

СІНХРО́ННАЯ МАШЫ́НА, звычайна 3-фазная электрычная *пераменнага току машына*, у якой вуглавыя скорасці вярчэння магн. поля і ротара аднолькавыя і кратныя частаце эл. току. Выкарыстоўваюцца ў прамысл. вытв-сці, энергетыцы і інш.

Асн. часткі: *статар* з абмоткай пераменнага току і *ротар* з абмоткай узбуджэння (сілкуецца пастаянным токам ад спец. ўзбуджальніка або праз выпрамнікі). Работа С.м. засн. на ўзаемадзеянні магн. поля, якое ствараецца абмоткай узбуджэння, з пераменным токам у абмотцы статара. Падзяляюцца на *сінхронныя генератары*, *сінхронныя электрарухавікі* і сінхронныя кампенсатары (працуюць у рэжыме рухавіка без нагрузкі на вал, выкарыстоўваюцца для павышэння *магутнасці каэфіцыента* і рэгулявання напружання ў канцы лі ў прамежкавых пунктах ЛЭП; гл. таксама *Кампенсатар*). *У.М.Сацута.*

СІНХРО́ННЫ ГЕНЕРА́ТАР, электрычная *сінхронная машына*, якая працуе ў генератарным рэжыме. Мех. энергія, якая пераўтвараецца С.г. у энергію пераменнага току, падаецца на ротар ад першаснага рухавіка — турбіны, рухавіка ўнутр. згарання і інш. С.г. з прыводам ад паравой або газавай турбіны наз. *турбагенератарам*, з прыводам ад гідраўл. турбіны — *гідрагенератарам*. Генератары *дызельных электрастанцый* прыводзяцца ў дзеянне дызельным рухавіком. Адрозніваюць 1- і 3-фазныя С.г. агульнапрамысл. і спец. прызначэння. Магутнасць да 1 ГВт і вышэй.

СІНХРО́ННЫ ЭЛЕКТРАРУХАВІ́К, электрычная *сінхронная машына*, якая працуе ў рэжыме рухавіка. У С.э. магн. поле *статара* і *ротар* маюць аднолькавую частату вярчэння *n*, якая знаходзіцца ў строгіх суадносінах да частаты эл. току f : $n=60f/p$, дзе p — колькасць пар полюсаў. Выкарыстоўваюцца ў прамысл. установуках, сістэмах аўтаматыкі, кінааапаратуры, быт. і інш. прыладах, якія патрабуюць пастаяннай вуглавой скорасці. Магутнасць ад долей вата да некалькіх дзесяткаў мегават.

У параўнанні з *асінхронным электрарухавіком* С.э. мае больш высокі *магутнасці каэфіцыент* і перагрузачную здольнасць. Аднак з-за неабходнасці сілкавання абмоткі ўзбуджэння ад генератара пастаяннага току ці статычнага ўзбуджальніка (іоннага, паўправадніковага выпрамніка), а таксама з-за асаблівасцей пуску (разгону да намінальнай вуглавой скорасці) часта не можа канкурыраваць з асінхронным рухавіком. Ротар С.э. малой магутнасці выконваецца ў выглядзе пастаяннага магніта, без абмоткі ўзбуджэння. Вял. ціхаходныя С.э. маюць яўнаполюсны ротар, высокаскарасныя — наяўнаполюсны. У С.э. малой магутнасці з-за адсутнасці абмоткі ўзбуджэння рэактыўны момант з'яўляецца асноўным, таму яны наз. рэактыўнымі. У пераўзбуджаным стане С.э. можа аддаваць рэактыўную энергію ў сетку — працаваць у рэжыме сінхроннага *кампенсатара*. *У.М.Сацута.*

СІНЦЫ́ТЫЙ (да грэч. syn разам + kytos клетка), тып жывёльнай і раслінай тканкі з няпоўным размежаваннем адросткавых клетак. Клеткі С. размешчаны ў прасторы ў выглядзе трохмернай сеткі. У арганізме чалавека існуе адзіны «сапраўдны» С. — ч. сперматагенных элементаў у семянных канальцах яечка. У раслін С. наз. сімпласт — шмат'ядзерны пратапласт арганізма, які не мае клетачнай будовы. *А.С.Леанцюк.*

СІНЧЖУНХО́Й (Таварыства адраджэння Кітая), першая кіт. рэв. арг-цыя, створаная ў 1894 г. *Сунь Ятсенам* у Гаалулу (Гавайскія а-вы). У 1895 яе суполкі ўзніклі ў Сянгане (Ганконгу) і Гуанчжоў; налічвалі каля 300 чал. Ставіла за мэту скінуць маньчжурскую дынастыю *Цын* і адрадзіць кіт. нац. кіраванне. У 1895 і 1900 арганізавала няўдалыя паўстанні на Пд Кітая. У 1905 чл. С. далучыліся да партыі *Тунмэнхой*.

П.С.Сінчукоў.

СІНЧУКО́Ў Пётр Сідаравіч (11.7.1920, г. Гомель — 14.9.1987), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Тамбоўскую ваен. авіяц. школу пілотаў (1943), Ваен.-паветр. інж. акадэмію імя Жукоўскага (1954). На фронце з 1943. Удзельнік вызвалення Украіны, Беларусі, баёў у Літве, Усх. Прусіі. Камандзір звяна штурмавога авіяпалка ст. лейтэнант С. зрабіў 163 баявыя вылеты, знішчыў 7 танкаў, 10 артыл. і мінамётных батарэй, 17 кропак зенітнай артылерыі, 19 аўтамашын і інш. Да 1956 у Сав. Арміі.

СІНЬКІ́, вёска ў Смаргонскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 17 км на Пд ад г. Смаргонь, 250 км ад Гродна, 13 км ад чыг. ст. Залессе. 341 ж., 138 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СІНЬКО́ВА Людміла Дзмітрыеўна (н. 2.12.1958, Мінск), бел. літаратуразнавец. Дачка Дз.Я.*Бугаёва*. Д-р філал. н. (1997), праф. (2001). Скончыла БДУ (1981), з 1984 працуе ў ім (з 1999 заг. кафедры). Даследуе бел. л-ру ў кантэксце сусв., заканамернасці і асаблівасці развіцця бел. л-ры ў 20 ст.: «Беларуская проза XX ст.: дынаміка жанравых структур», «Цукровы пеўнік: Літаратурна-крытычныя артыкулы» (абедзве 1996) і інш. Адна са складальнікаў хрэстаматыі «Беларуская літаратура: Проза 20-х гг.» (1996), аўтар і сааўтар вучэбных дапаможнікаў для школы і ВНУ. Друкуецца пад псеўд. Корань.

СІНЬСЯ́Н, горад на Пн Кітая, на р. Вэйхэ, прав. Хэнань. Каля 500 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Цэнтр баваўнаводчага раёна. Прам-сць баваўняная і харчовая. Паблізу здабыча кам. вугалю.

СІНЬХА́ЙСКАЯ РЭВАЛЮ́ЦЫЯ 1911—13, падзеі ў Кітаі, у выніку якіх скінута ўлада іншаземнай (маньчжурскай) дынастыі *Цын* і ўсталявана рэспубліка. Пачалася паводле традыц. кіт. календара ў год «сіньхай» (адсюль назва). Створаная *Сунь Ятсенам* арг-цыя *Тунмэнхой* напярэдадні С.р. рыхтавала антыманьчжурскае паўстанне. Аднак рэпрэсіі супраць яе членаў выклікалі 10.10.1911 стыхійнае паўстанне ў гарнізоне г. Учан (прав. Хубэй). Неўзабаве пад кантроль паўстанцаў перайшла ўся прав. Хубэй, а ў кастр.-лістападзе 1911 да паўстання далучыліся яшчэ 14 правінцый, якія адмовіліся прызнаваць уладу Цынаў. У выніку Цынскі двор быў вымушаны прызначыць 2.11.1911 прэм'ер-міністрам ліберальнага ген. *Юань Шыкая*, які ў снеж. 1911 пачаў у г. Нанкін перагаворы з дэлегатамі ад паўстаўшых правінцый. Сход дэлегатаў абраў часовым прэзідэнтам Кіт. рэспублікі Сунь Ятсена (уступіў на пасаду 1.1.1912), прыняў шэраг законаў, якія скасавалі найб. адыёзныя перажыткі кіт. грамадства (рабства і г.д.) і дэкларавалі дэмакр. свабоды. Ва ўмовах супрацьстаяння Поўдня і Поўначы Кітая рэвалюцыянеры пайшлі на кампраміс: Юань Шыкай прымусіў рэгента пры малалетнім імператару Пу І падпісаць 12.2.1912 адрачэнне Цынаў ад прастола, а Сунь Ятсен падаў у адстаўку. Часовым прэзідэнтам Кіт. рэспублікі 15.12.1912 абраны Юань Шыкай. 10.3.1912 прынята канстытуцыя Кіт. Рэспублікі, у крас. створаны часовы парламент. У жн. 1912 Сунь Ятсен стварыў Нац. партыю (Гаміньдан), якая на парламенцкіх выбарах у канцы 1912 атрымала большасць галасоў. Канфлікт паміж прэзідэнтам Юань Шыкаем, які дамагаўся поўнай улады, і парламентам абвастрыўся забойствам некалькіх выдатных рэв. дзеячаў, справакаваў прыхільнікаў Сунь Ятсена ў ліп. 1913 на ўзбр. паўстанне. У жн. 1913 паўстанне задушана, Сунь Ятсен пакінуў Кітай. Юань Шыкай прымусіў парламент абраць сябе пастаянным прэзідэнтам Кіт. Рэспублікі, ён забараніў Гаміндан, у студз. 1914 распусціў парламент, 1.4.1914 выдаў новую канстытуцыю, якая дала яму амаль неабмежаваныя паўнамоцтвы. Аднак падзеі 1911—13 спрыялі ў наступныя гады хуткаму развіццю Кітая, а ў выніку — моцнаму культ. і інтэлектуальнаму ўздыму, які падрыхтаваў *Рэвалюцыю 1925—28 у Кітаі*.

Літ.: Белов Е.А. Учанское восстание в Китае (1911 г.). М., 1971; Ефимов Г.В. Буржуазная революция в Китае и Сунь Ят-Сен (1911—1913 гг.). М., 1974; Синьхайская

революция, 1911—1913 гг.: Сб. док. и материалов. М., 1968; Синьхайская революция (1911—1913 гг.) в современной историографии КНР. М., 1988. *У.У.Куніцкі.*

СІНЬХУА́, дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва Кітая. Засн. ў 1938 у г. Яньань, з 1949 у Пекіне. Абслугоўвае друк, радыё, тэлебачанне краіны. Перадае паведамленні за мяжу на кіт., англ., рус. і інш. мовах. Рассылае бюлетэні, распаўсюджвае фотаінфармацыю для кіт. і замежнага друку.

СІНЬЦЗЯ́Н-УЙГУ́РСКІ АЎТАНО́МНЫ РАЁН, Сіньцзян, аўтаномны раён на ПнЗ Кітая. На Пн і З мяжуе з Манголіяй, Расіяй, Казахстанам, Кіргізіяй, Таджыкістанам, Афганістанам, Пакістанам, Індыяй. Пл. 1600 тыс. км^2, нас. каля 18 млн. чал. (2001), у т.л. уйгуры (75%), сярод астатніх найб. кітайцаў. Адм. і гал. прамысл. цэнтр — г. *Урумчы*. Большая ч. паверхні — пустынная і паўпустынныя Джунгарская і Кашгарская раўніны, падзеленыя хрыбтамі Усх. Цянь-Шаня. На Пд горы Куньлунь і Каракарум (г. Чагары выш. 8611 м), на Пн Мангольскі Алтай. Клімат субтрапічны засушлівы, кантынентальны. Ападкаў на раўнінах 100—300 мм за год, у гарах да 800 мм. Расліннасць пераважна пустынная і паўпустынная. У гарах хваёвыя лясы. Найб. развіта сельская гаспадарка. Земляробства пераважна на арашальных землях. Гал. с.-г. культуры — пшаніца, кукуруза, рыс (займаюць больш за 50 % апрацаваных зямель), а таксама бавоўнік, рапс, канаплі. У аазісах вінаградарства і садоўніцтва (абрыкосы, яблыкі, грушы, грэцкі арэх), бахчаводства (дыні, кавуны). Шаўкаводства. У пустынях і паўпустынях (найб. на Пн) жывёлагадоўля (авечкі, козы, буйн. раг. жывёла, вярблюды, коні). Здабыча нафты, вугалю, рэдкіх і каштоўных металаў, графіту, нефрыту. Гал. галіны апрацоўчай прам-сці: нафтаперапр., металургічная, маш.-буд. (аўтазборка і аўтарамонт, с.-г. машынабудаванне і інш.), хім., буд. матэрыялаў, тэкст., гарбарная. Рамёствы (тканіны, дываны, кашма, скуры і скураныя вырабы, папера і інш.). Транспарт чыг. і аўтамабільны.

СІ́НЬША, возера ў Расонскім р-не Віцебскай вобл. (Беларусь), на мяжы з Пскоўскай вобл. (Расія), у бас. р. Дрыса (цячэ праз возера), за 37 км на У ад г.п. Расоны. Пл. 2,53 км^2, даўж. 4 км, найб. шыр. 1,44 км, найб. глыб. 7,1 м, даўж. берагавой лініі 9,9 км. Пл. вадазбору 1782 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу, падзелена 2 астравамі (агульнай пл. 0,17 км^2) і паўвостравам на 2 часткі, злучаныя вузкімі пралівамі. Схілы выш. 10—15 м (на ПнУ 5—8 м) пясчаныя, пад лесам. На Пн і У тэраса выш. 1,2 м. Пойма шыр. 10—20 м, укрытая хмызняком. Берагі зліваюцца са схіламі, пясчаныя, моцна зрэзаныя, утвараюць многа невял. заліваў. Дно да глыб. 2,5—3 м пясчанае, ніжэй ілістае і сапрапелістае. Зарастае да глыб. 3,5 м, асабліва паўн. частка. Уздоўж берагоў паласа надводнай расліннасці шыр. 20—30 м, да глыб. 2,2 м. У залівах паўн.-ўсх. ч. возера расце вадзяны арэх, занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Злучана пратокамі з азёрамі Валоба (на ПнЗ) і Данское (на Пд). Турызму, зона адпачынку.

СІ́НЬША, ландшафтны заказнік рэсп. значэння ў Расонскім р-не Віцебскай вобл. Засн. ў 1996 для аховы унікальных прыродных ландшафтаў і азёрных экасістэм у вытоках р. Дрыса. Пл. 13,398 тыс. га. Водна-ледавіковы тып рэльефу з абс. выш. 140—160 м, верхнія слаі антрапагенных парод прадстаўлены розназярністымі пяскамі. Шматлікія камавыя і озавыя формы, тэрмакарставыя катлавіны і лагчыны складзены з валунных марэнных суглінкаў і супескаў. У заказніку 21 возера, агульнай пл. 15 км^2. Іхтыяфаўна ляшчова-шчупаковая, 17 відаў рыб-абарыгенаў. Лясная расліннасць займае больш за 80% пл., у асн. хвойныя лясы. У флоры больш за 400 відаў вышэйшых раслін, з іх 5 відаў занесены ў Чырв. кнігу Беларусі: баранец звычайны, вадзяны арэх плывучы, гарлянка пірамідальная, мякатніца адналістая, гідрыла кальчаковая. Фаўна таежнага комплексу (9 відаў земнаводных, 5 — рэптылій, 122 — птушак, 28 — млекакормячых). Шмат глушца, цецерука, рабчыка, вальдшнэпа, дзіка, казулі, лася, бабра, куніцы, норкі, лісоў. У Чырв. кнізе Беларусі мядзведзь бury, рысь, сыч касматаногі, няясыць даўгахвостая, дзяцел трохпальцы і інш. *П.І.Лабанок.*

П.Сіньяк. Гавань у Марселі. 1907.

СІНЬЯ́К (Signac) Поль (11.11.1863, Парыж — 15.8.1935), французскі жывапісец, тэарэтык мастацтва. Вучыўся ў Парыжы ў вольнай майстэрні Бінга. Адзін з заснавальнікаў Т-ва незалежных мастакоў (1884; з 1903 яго віцэ-прэзідэнт, з 1909 прэзідэнт). У ранні перыяд творчасці быў блізкі да імпрэсіяністаў, з 1886 пад уздзеяннем Ж.Сёра далучыўся да *неаімпрэсіянізму*. Пісаў пейзажныя віды Пд Францыі, спакойныя па кампазіцыі, у стрыманай збалансаванай гаме («Маяк у Порт-Рые», 1888; «Пясчаны бераг мора», 1890; «Гавань у Марселі», 1907; «Марсельскі порт», 1911; «Канал Сен-Мартэн», 1933), партрэты («Партрэт Фелікса Фенеона», 1890), лірычныя сцэны і дэкар. кампазіцыі, у якіх раскрываў сваю канцэпцыю ідэальнага анархісцкага грамадства («Нядзеля ў Парыжы», 1890; «Жанчына прычэсваецца», «Дзве жанчыны каля студні», абедзве 1892; «У часы гармоніі»,1894). Мадыфікаваў тэхніку *пуантылізму*, выкарыстоўваў невялікія, строга ўпарадкаваныя квадратныя мазкі чыстага, інтэнсіўнага колеру: «Дамба ў Партрыё» (1888), «Хвоя. Сен-Трапез» (1909) і інш. Аўтар кн. «Ад Эжэна Дэлакруа да неаімпрэсіянізму» (1899), «Іонгкінд» (1927).

Літ.: Ж.Сёра. П.Синьяк. Письма. Дневники...: Пер. с фр. М., 1976; Калитина Н. П.Синьяк. Л., 1976. *С.У.Пешын.*

СІНЬЯРЫ́Я (ад італьян. signoria панаванне, улада), 1) орган гар. самакіравання ў італьян. гарадах-камунах 13—14 ст. 2) Форма паліт. ладу шэрагу гарадоўдзяржаў Паўн. і Сярэдняй Італіі 2-й пал. 13 ст. — сярэдзіны 16 ст., пры якой уся грамадз. і ваен. ўлада канцэнтравалася ў руках сіньёра (тырана, гл. *Тыранія*). Пераход ад выбарнага калегіяльнага кіравання камуны да С. адбываўся ва ўмовах жорсткай барацьбы паміж папаланамі (гандл.-рамесніцкія слаі) і феадаламі, калі ні адзін з бакоў не мог атрымаць поўнай перамогі. У выніку ўсталёўвалася дыктатура, якая

буйнымі, правіцелі якіх атрымалі тытулы герцагаў ці маркізаў (так утварыліся герцагствы Міланскае, Тасканскае, Ферара і інш.).

СІНЬЯРЭ́ (Signoret; сапр. Каміне р; Kaminker) Сімона (25.3.1921, г. Вісбадэн, Германія — 30.9.1985), французская кінаактрыса. Вядомасць набыла выкананнем гал. роляў у фільмах рэж. Ж.Бекера «Залаты шлем» (1952), М.Карнэ «Тэрэза Ракэн» (1953), «Салемскія ведзьмы» (1956; прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Карлавых Варах, 1957). Майстэрства С. найб. выявілася ў выкананні ролі Эліс («Месца наверсе», 1958; у сав. пракаце «Шлях у вышэйшае грамадства»; прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Канах, прэмія «Оскар», прэмія Брыт. і Франц. акадэмій). Сярод значных работ — ролі ў фільмах «Цень і святло» (1951), «Смерць у гэтым садзе» (1956), «Дзень і час» (1963), «Карабель дурняў» (1965), «Чайка» (1968), «Кот» (1971, прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Зах. Берліне), «Усё жыццё наперадзе» (1977, прэмія «Сезар»), «Гі дэ Мапасан» (1982) і інш.

СІНЬЯРЭ́ЛІ (Signorelli) Лука (паміж 1445—50, г. Картона, Італія — 16.10.1523), італьянскі мастак эпохі *Адраджэння*. Вучыўся ў П'ера дэла Франчэскі, зазнаў уплыў А. дэль *Палаёлы* і *Перуджына*. Працаваў у Картоне, Флярэнцыі, Ларэце, Рыме, Арвіета і інш. Творы вызначаюцца строгасцю, геаічнасцю вобразнага ладу: фрэскі ў Сіксцінскай капэле Ватыкана (1481—83), у клуатры манастыра Монтэалівета Маджорэ ў Таскане (1497), капэле Сан-Брыцыо сабора ў Арвіета (1499—1504); станковыя карціны «Мадонна на троне ў акружэнні святых» (1484), «Пан» (1488—90). Асаблівую ўвагу аддаваў выяўленню фігуры чалавека ў складаных ракурсах з падкрэсленай выразнасцю пластычнай мадэліроўкі, напружанасцю контурнага малюнка, якому ў позніх работах уласціва некат. застыласць.

СІНЭКАЛО́ГІЯ (ад грэч. syn разам + *экалогія*), раздзел экалогіі, які вывучае ўзаемаадносіны згуртаванняў арганізмаў (*біяцэнозаў*) з навакольным асяроддзем.

СІНЮ́ХА, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1978), жалезістая мінеральная лінза. Размешчана за 2 км на ПнЗ ад в. Астравы Вілейскага р-на Мінскай вобл., на аднайм. балоце, у пойме р. Зуйка. Даўж. да 100 м, шыр. 50—60 м, магутнасць тоўшчы да 20 см, глыб. залягання 1,1 м. Характарызуецца жалезістай мінералізацыяй у тарфяным пакладзе, якая прадстаўлена калоідным протамагнетытам, гнёздамі гематыту і магнетыту, а таксама калоідным і зярністым сцяжэннямі сідэрыту і вівіяніту. Канцэнтрацыя мінералаў жалеза да 40%. С. — адзінае ва Усх. Еўропе месцазнаходжанне жалезістай мінералізацыі, якая ўтварылася ва ўмовах павышаных гідрадынамічных уласцівасцей адкладаў. Пры змене фізіка-хім. умоў асяроддзя мінералізацыя пераўтворыцца ў балотную руду. *В.Ф.Вінакураў.*

СІНЮ́ХА (Polemonium), род кветкавых раслін сям. сінюхавых. Каля 50 відаў. Пашыраны ў халодным і ўмераным паясах Паўн. і Паўд. Амерыкі, радзей у Еўразіі. На Беларусі 1 від — С. блакітная (P.caeruleum), нар. назвы гадзіннік, аструшка, рабінка. Трапляецца па берагах рэк, на вільготных лугах, у хмызняках. Інтрадукаваны С.: каўказская (P. caucasicum), мяса-чырвоная (P. carneum), паўзучая (P. reptans).

Шматгадовыя травяністыя расліны. Сцёблы прамастойныя, неразгалінаваныя. Лісце чаргаванае, няпарнаперыстае. Кветкі двухполыя ў мяцёлчатых або шчыткападобна-мяцёлчатых суквецціях. Плод — каробачка. Карэнішча і карані С. блакітнай маюць да 30% *сапанінаў*, смолы, арган. к-ты, эфірны алей. Лек., дэкар., меданосныя расліны.

А.М.Скуратовіч.

СІНЮ́ХА, цыяноз, сінюшная афарбоўка скуры і слізістых абалонак чалавека. Больш відавочная на твары, губах, пальцах рук і ног. Абумоўлена высокай колькасцю ў крыві адноўленага *гемаглабіну* (больш за 50 г/л пры норме да 30 г/л). Бывае сімптомам розных захворванняў (найб. часта назіраецца пры дыхальнай недастатковасці і захворваннях сэрца); пры прыроджаных пароках сэрца бывае прыроджаная С. Лячэнне накіравана на асн. захворванне. *М.З.Ягоўдзік.*

СІНЯГО́ВА, вёска ў Пасецкім с/с Старадарожскага р-на Мінскай вобл., на аўтадарозе, якая злучае вёску з г. Старыя Дарогі. Цэнтр калгаса. За 22 км на ПдЗ ад горада і чыг. ст. Старыя Дарогі, 170 км ад Мінска. 408 ж., 169 двароў (2001). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў, партызан і ахвяр фашызму. Помнік сав. воінам і землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Мемарыяльны комплекс у гонар воінаў 121-й стралковай дывізіі.

Сінюха блакітная.

Л.**Сіньярэлі**. Паўстанне з мёртвых. Фрэска капэлы Сан-Брыцыо сабора ў Арвіета. 1499—1504.

СІНЯГО́РСКАЯ, вёска ў Студзёнкаўскім с/с Сенненскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса. За 7 км на У ад г. Сянно, 63 км ад Віцебска, 22 км ад чыг. ст. Бурбін. 304 ж., 110 двароў (2001). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

СІНЯГУ́Б Сяргей Сілавіч (13.12.1851, с. Бяляеўка Вальнянскага р-на Запарожскай вобл., Украіна — 2.11.1907), расійскі рэвалюцыянер-народнік. З 1871 вучыўся ў Пецярб. тэхнал. ін-це. З 1872 чл. т-ва *чайкоўцаў*. Адзін з арганізатараў рабочых гурткоў у Пецярбургу і прапагандыстаў у асяроддзі рабочых. У 1873 арыштаваны і зняволены ў Петрапалаўскую крэпасць. Паводле *«працэсу 193-х»* (1877—78) асуджаны да 9 гадоў катаржных работ. Пакаранне адбываў на Кары. З 1881 на пасяленні ў Чыце. Аўтар успамінаў «Запіскі чайкоўца» (выд. 1929), рэв. вершаў, надрукаваных у нелегальных зборніках.

СІНЯ́К (Echium), род кветкавых раслін сям. агурочнікавых. Каля 50 відаў. Пашыраны ў Еўропе, Зах. Азіі і Афрыцы. На Беларусі 1 від — С. звычайны (E. vulgare), нар. назвы печаніца, асацец, кепек. Трапляецца на сухіх схілах, сметніках, каля дарог. Інтрадукаваны С. плямісты (E. maculatum) і трыпутнікавы (E. plantagineum).

Сіняк звычайны.

Адна-, двух-, радзей шматгадовыя цвёрдаваласістыя травы выш. 30—100 см. Сцёблы неразгалінаваныя, прамастойныя. Лісце чаргаванае, суцэльнае, суцэльнакрайняе. Кветкі ў густых завітках, сабраныя на верхавінцы сцябла ў складанамяцёлчатае або коласападобнае суквецце. Плод — арэшак. Усе часткі С. звычайнага ядавітыя (маюць алкалоіды). Лек., алейныя, фарбавальныя, меданосныя, дэкар. расліны. *А.М.Скуратовіч.*

СІНЯ́К (Gyroporus cyanescens), шапкавы базідыяльны грыб сям. балетавых. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн. Амерыцы. На Беларусі трапляецца ў жн.—вер. на пясчанай глебе ў хвойніках і дубровах.

Пладовае цела — шапка на ножцы. Шапка дыяметрам 6—15 см, пукатая, потым распасцёртая, сухая, апушаная, светла-бурая або саломенна-жоўтая. Мякаць белая, на зломе хутка і моцна сінее (адсюль назва). Трубачкі свабодныя з белымі або ружавата-бураватымі порамі. Ножка выш. 7—8 см, клубнепадобная, аднаго колеру з шапкай. Споры гладкія, яйцападобныя, светла-жаўтаватыя. Ядомы.

СІНЯКО́Ў Генадзь Мікалаевіч (н. 30.1.1942, в. Болдырава Кесавагорскага р-на Цвярской вобл., Расія), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1993). Скончыў БДУ (1964). З 1966 у Ін-це фізікі, з 1992 у Ін-це малекулярнай і атамнай фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па спектраскапіі, фотахіміі, люмінесцэнцыі біялагічна важных тэтрапірольных малекул. Вызначыў асаблівасці электронай будовы аніёнаў хларафілападобных злучэнняў. Устанавіў механізм фотахім. аднаўлення парфірынаў.

Тв.: Промежуточные продукты реакции восстановления порфиринов и их строение (разам з А.М.Шульгой, Г.П.Гурыновічам) // Биофизика. 1978. Т. 23, № 1; Взаимодействие анионных форм Fe-октаэтилпорфирина с метанолом // Журн. прикладной спектроскопии. 2000. Т. 67, № 5.

СІНЯ́ЎКА, вёска ў Клецкім р-не Мінскай вобл., каля р. Нача, на скрыжаванні аўтадарог на Клецк, Ганцавічы, Слуцк, Івацэвічы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 17 км на ПдЗ ад горада і чыг. ст. Клецк, 144 км ад Мінска. 1728 ж., 714 двароў (2001). Мэблевая ф-ка, лесаапр. цэх, філіял дарожна-рамонтнага ўпраўлення. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Царква. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік архітэктуры — паштовая станцыя (1-я пал. 19 ст.).

Вядома з канца 15 ст. ў складзе Клецкага княства. З 1552 мястэчка, уласнасць каралевы Боны Сфорца, у 1568—1690 у Клецкай ардынацыі кн. Радзівілаў. З 1793 у Рас. імперыі, цэнтр воласці Слуцкага пав. Мінскай губ. З 19 ст. адзін з цэнтраў вытв-сці ганчарных вырабаў (гл. *Сіняўская кераміка*). У 1886 у С. 144 ж., 24 двары, валасная ўправа. 2 царквы, сінагога, яўр. малітоўны дом, школа, паштовая станцыя, 7 крам, у 1905 каля 500 ж. З 29.7.1920 у Нясвіжскім пав. З 1921 у Польшчы, цэнтр гміны Навагрудскага ваяв. З 1939 у БССР. З 1940 цэнтр сельсавета Клецкага р-на. У Вял. Айч. вайну ням.-фаш. захопнікі летам 1941 стварылі тут гета, у якім у чэрв. 1942 правялі масавы расстрэл яўрэяў (загінула каля 700 жыхароў вёскі). У 1962—66 у Нясвіжскім р-не.

СІНЯ́ЎСКАЯ Тамара Ільінічна (н. 6.7.1943, Масква), расійская спявачка (меца-сапрана). Жонка М.*Магамаева*. Нар. арт. Расіі (1976). Нар. арт. СССР (1982). Скончыла Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва (1970). З 1964 салістка Вял. т-ра ў Маскве. Валодае голасам рэдкай прыгажосці і насычанасці гучання. Сярод партый: Ваня, Ратмір («Іван Сусанін», «Руслан і Людміла» М.Глінкі), Любаша («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Кармэн («Кармэн» Ж.Бізэ), Камісар («Аптымістычная трагедыя» А.Холмінава). Гран-пры Міжнар. конкурсу вакалістаў у Верв'е (Бельгія, 1969), 1-я прэмія на Міжнар. конкурсе імя Чайкоўскага (Масква, 1970).

Літ.: Гусев А.И., Хачатурова Н.А. Т.Синявская: Творч. портрет. 2 изд. М., 1988.

СІНЯ́ЎСКАЯ КЕРА́МІКА, бел. традыцыйныя ганчарныя вырабы з вёсак Сіняўка, Ганявічы, Масцілавічы, Забалатнікі Клецкага р-на Мінскай вобл. У 19 — 1-й пал. 20 ст. працавала каля 200 ганчароў. Выраблялі чорназадымлены і гартаваны посуд гасп. прызначэння: гаршкі, міскі, гладышы, макатры і інш. Фармоўка з буйназярністай масы на нажным ганчарным крузе вызначала асн. асаблівасці С.к.: простыя, лаканічныя прысадзістыя формы сінявата-чорнага колеру (чорназадымленыя) ці аздобленыя чорна-карычневымі плямамі на тэракотавай шурпатай паверхні чарапка з украпінамі жарствы (гартаваныя). Найб. вядомыя майстры 1940—70-х г.: К.Дудук, Ф.Вашчыла. З пач. 1980-х г. промысел не існуе. *Я.М.Сахута.*

СІНЯ́ЎСКІ Іван Іванавіч (22.6.1919, в. Жажэлка Смалявіцкага р-на Мінскай вобл. — 15.9.2001), бел. пісьменнік. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1941). У 1946—78 настаўнічаў. Дэбютаваў вер-

Сіняк.

Сіняўская кераміка.

шамі ў 1936. Кн. апавяданняў «Ой, рэчанька, рэчанька...» (1962), «Вернасць» (1971), аповесць «Заранка» (1971) прысвечаны калгаснай вёсцы. Раман «Дарога на Замлынне» (1980) пра подзвіг народа ў Вял. Айч. вайну. Аўтар аповесцей «На правым флангу» (1964, пра Героя Сав. Саюза П.І.Купрыянава) і «Сінія вочы» (1986, пра вёску напярэдадні калектывізацыі). Пісаў для дзяцей пра станаўленне і фарміраванне характару падлеткаў, пошук імі мэты і сэнсу жыцця: зб-кі апавяданняў «У навальніцу» (1949), «Новая школа» (1951), «Піянерскі гальштук» (1955), «Дабрадзейка» (1960), «Марка» (1969).

Тв.: А вяселля не было: Аповесці. Апавяданні. Мн., 1989; Вярыгі: Раман. Мн., 2001.

І.У.Саламевіч.

Т.І.Сіняўская.

Я.Сіпакоў.

СІ́НЯЯ, рака ў Асіповіцкім р-не Магілёўскай вобл., правы прыток р. *Свіслач* (бас. р. Дняпро). Даўж. 23 км. Пл. вадазбору 508 км². Цячэ на Пд Цэнтральнабярэзінскай раўніны. Пачынаецца за 3 км на З ад в. Паплавы, вусце за 2,8 км на ПнУ ад в. Цяплухі. Рэчышча каналізаванае. Асн. прытокі: Пратасевіцкі канал (злева) і Каранскі канал (справа). На рацэ г. Асіповічы.

«СІ́НЯЯ БЛУ́ЗА», савецкі тэатр малых форм; від агітацыйнай эстрады ў 1923 — пач. 1930-х г. Узнікла ў Маскоўскім ін-це журналістыкі на базе «жывой газеты»; першапачаткова тэатр.-эстрадны калектыў (удзельнікі выступалі ў сіняй рабочай блузе — адсюль назва). Ініцыятар стварэння і кіраўнік Б.С. Южанін. Выступалі ў клубах, цэхах фабрык і заводаў. Выкарыстоўваўся агітацыйна-паліт. рэпертуар з надзённай тэматыкай; у паказах спалучаліся гераіка і патэтыка, сатыра і гумар. Праграмы будаваліся на калект. дэкламацыі, прыпеўках, фізкультурных танцах і інш. «С.б.» паслужыла асновай для стварэння шэрагу прафес. т-раў і дала штуршок да пошукаў новых форм тэатр. і эстрадных прадстаўленняў, паўплывала на развіццё маст. самадзейнасці, на рабочы т-р за мяжою. На Беларусі інтэнсіўны рух «С.б.» пачаўся ў 1924—25 пасля гастролей у Мінску «С.б.» Маскоўскага гар. савета прафсаюзаў. Гурткі «С.б.» існавалі амаль пры кожным клубе рабочых прадпрыемстваў Мінска, Віцебка, Гомеля, Магілёва, Полацка, Барысава, Бабруйска і інш.

СІ́ПА, рака ў Зэльвенскім і Мастоўскім р-нах Гродзенскай вобл., левы прыток р. *Шчара* (бас. р. Нёман). Даўж. 26 км. Пл. вадазбору 147 км². Пачынаецца каля в. Грабава Зэльвенскага р-на, цячэ праз воз. Азяранскае, упадае ў р. Шчара на ПнЗ ад в. Пясчанка Мастоўскага р-на. Рэчышча на працягу 9 км каналізаванае. Пойма да возера амаль на ўсім працягу забалочаная.

СІ́ПАВІЦКІ КА́МЕНЬ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1992). Размешчаны за 300 м на ПдЗ ад в. Сіпавічы Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. Валун шэрага дробназярністага граніту кіроўнага тыпу. Даўж. 3,9 м, шыр. 2,7 м, выш. 1,4 м, у абводзе 10,9 м, аб'ём 7,8 м³, маса каля 20,7 т. Прынесены ледавіком каля 20—18 тыс. гадоў назад з У Швецыі. Мае прасападобную форму, на верхняй пляцоўцы захавалася паўсферычная выемка (дыяметр 5 см, глыб. 3 см) з адшліфаванымі сценкамі. Ямка зроблена чалавекам каля 2—2,5 тыс. гадоў назад. У старажытнасці валун меў культавае значэнне. *В.Ф.Вінакураў.*

СІПА́І (на мове хіндзі, урду і перс. сіпахі — воін, салдат), з сярэдзіны 18 ст. да 1947 наёмныя салдаты ў Індыі, якіх вербавалі з мясц. жыхароў у каланіяльныя (партуг., франц., англ.) арміі. Першыя фарміраванні С. створаны ў 1740-х г. ген.-губернатарам франц. уладанняў ў Індыі для барацьбы з англічанамі і захопу інш. тэр. Найб. шырока С. выкарыстоўвалі англ. каланізатары, у т.л. для ваен.-паліцэйскай службы. Пасля задушэння *Індыйскага народнага паўстання 1857—59*, у якім С. актыўна ўдзельнічалі, англічане рэарганізавалі фарміраванні С. (паменшылі іх колькасць, не прызывалі мясц. жыхароў у інж. і артыл. часці). С. ўдзельнічалі ў 1-й і 2-й сусв. войнах. С. як калан. наёмныя войскі перасталі існаваць пасля ўтварэння ў 1947 дзяржаў Індыя і Пакістан.

СІПА́ЙСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ, Сіпаю паўстанне, пашыраная ў гіст. л-ры другая назва *Індыйскага народнага паўстання 1857—59*, ударнай сілай якога былі воіны-*сіпаі* (адсюль назва).

СІПАКО́Ў Янка (Іван Данілавіч; н. 15.1.1936, в. Зубрэвічы Аршанскага р-на Віцебскай вобл.), бел. пісьменнік. Засл. дз. культ. Беларусі (1997). Скончыў БДУ (1960). Працаваў у час. «Вожык» (1960—73), «Маладосць» (1973—93), выд-ве «Беларуская Энцыклапедыя» (1993—97). З 1997 у час. «Беларусь». Друкуецца з 1953. Першы зб. вершаў «Сонечны дождж» (1960). Паэт пераважна лірычнага складу, актыўны ў пошуках самавызначэння, спалучэння творчай традыцыі і наватарства. Аўтар зб. «Лірычны вырай» (1965), кніг паэзіі «Дзень» (1968), «З вясны ў лета» (1972), у якіх паглыбленае асэнсаванне гістарызму і гуманізму, паэт. эксперыменту на сумежжы сілаба-танічнага верша і верлібра. Гармонія зместу і формы, стылявая выразнасць у этапным творы «Веча славянскіх балад» (1973, Дзярж. прэмія Беларусі імя Я.Купалы 1976, дап. выд. 1998). Трывога за лёс зямлі і чалавека на ёй у зб-ках «У поўдзень, да вады» (1976), «Усміхніся мне» (1984). У вянку санетаў «Жанчына» тэмы адказнасці чалавека за будучае планеты, чысціні і прыгажосці чалавечых дачыненняў. Аўтар зб. нарысаў «Па зялёную маланку» (1971), кнігі прозы «Крыло цішыні» (1976). Аповесці «Крыло цішыні» (1974) і «Усе мы з хат» (1975) вызначылі лірычную стыхію і «перакрыжаваную» ў часе кампазіцыю наступных яго празаічных твораў (кнігі «Жанчына сярод мужчын», 1980; «Спадзяванне на радасць», 1983; «Пяць струн», 1984; «Журба ў стылі рэтра», 1990). У аповесці «Жыві як хочацца» (1979), апавяданнях праблемы сучаснага горада, духоўны свет інтэлігента. Развівае ў бел. л-ры жанры прытчаў (зб. «Тыя, што ідуць», 1993), паэм у прозе («Ахвярны двор», 1991). Аўтар фантастычна-прыгодніцкай аповесці «Блуканне па іншасвеце» (1994), гіст. апавяданняў, цыклаў мініяцюр, а таксама зб-каў гумару «Лысы юбілей» (1965), «Плюс на мінус» (1973), «Ланцугі для мух» (1980), «Пятніца ў суботу» (1988). На бел. мову пераклаў асобныя творы Ду Фу, А.Пушкіна, А.Блока, Т.Шаўчэнкі, Р.Тагора, А.Міцкевіча, А.Туманяна, А.Цэрэтэлі, В.Хлебнікава, Э.Межэлайціса і інш., паасобныя песні карэла-фінскага эпасу «Калевала». Выдаў кн. перакладаў «Ліст травы» У.Уітмена (1978), «Турэмны дзённік» Хо Шы Міна (1985), «Санеты смутку» Ф.Прэшэрна (1987), «Вершы ў прозе» І.Тургенева (1994), зб. «На волю птушку выпускаю» (1989).

Тв.: Вочы ў вочы: Выбр. паэзія. Мн., 1978; Сад людзей: Выбр. тв. Т. 1—2. Мн., 1985; Выбр. тв. Т. 1—2. Мн., 1995—97; Падары нам дрэва. Мн., 1997.

Літ.: Бечык В. Свет жывы і блізкі. Мн., 1974; Юрэвіч У. Абрысы. Мн., 1976; Вярцінскі А. Высокае неба ідэалу. Мн., 1980; Лойка А. Паэзія і час. Мн., 1981; Савік Л. Адчуванне часу. Мн., 1981; Андраюк С. Жыць чалавекам. Мн., 1983; Тычына М. Змена квадры. Мн., 1983; Кабаковіч А. Беларускі свабодны верш. Мн., 1984; Лобан М. Пяць раніц тыдня. Мн., 1984; Лысенка А. Лінія гарызонта: Нарыс творчасці Янкі Сіпакова. Мн., 1986.

А.Ф.Лысенка, І.У.Саламевіч.

СІПА́РАЎ Іосіф Мікітавіч (27.9.1924, в. Задарожжа Сенненскага р-на Віцебскай вобл. — 10.9.1994), бел. вучоны ў галіне хірургіі і анкалогіі. Д-р мед. н., праф. (1975). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1952). З 1963 гал. хірург Віцебскага абл. аддзела аховы здароўя. З 1966 у Віцебскім мед. ін-це (у 1979—84 рэктар). Навук. працы па таракальнай хірургіі і вывучэнні рэактыўнасці арганізма пры пасляаперацыйных гнойных ускладненнях.

Тв.: Обширные резекции кишечника. Мн., 1974 (разам з У.М.Велічэнкам); Клиника и лечение синдрома укороченного кишечника. Мн., 1988 (разам з М.Р.Лудам).

СІ́ПАРЫС (Siparis) Юозас (10.3.1894, в. Кусяй Таўрагскага пав., Літва — 5.4.1970), літ. акцёр. Нар. арт. СССР (1954). У 1920—25 акцёр т-раў сатырычнага «Вілкалакіс» і Нацыянальнага, у 1925—40 Дзярж. т-ра ў Каўнасе, у 1940—59 Драм. т-ра Літвы. Выканаўца яркіх характарных роляў: Шарунас («Шарунас» В.Крэве), Вінгіс («Нявестка» паводле Жэмайтэ), Кнураў («Беспасажніца» А.Астроўскага), Земляніка («Рэвізор» М.Гогаля), Пішчык («Вішнёвы сад» А.Чэхава), Ленін («Крамлёўскія куранты» М.Пагодзіна, «Незабыўны 1919» У.Вішнеўскага; Дзярж. прэмія СССР 1952) і інш. Здымаўся ў кіно.

СІПАХІ́, спахі, спахіі, спагі (тур. sipahi ад перс. сіпахі — воін, салдат), у Асманскай імперыі: 1) агульная назва ваен. леннікаў, якія за службу ў арміі атрымлівалі ад султана зямельныя падараванні. У 15—16 ст. С. складалі асн. частку тур. арміі. Фармальна ін-т С. існаваў да адмены ваен.-леннай сістэмы (1834). 2) Воіны кав. атрадаў, што ўваходзілі ў 15—18 ст. у склад рэгулярнага тур. войска, якое знаходзілася на ўтрыманні ўрада.

СІПІ́ШЧАВА, вёска ў Малабахаўскім с/с Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса. За 15 км на Пд ад г. Дуброўна, 107 км ад Віцебска, 23 км ад чыг. ст. Асінаўка. 273 ж., 104 двары (2001). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СІПКО́ Мікалай Георгіевіч (19.12.1906, в. Панкры, Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. — 1989), бел. вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1969), праф. (1970). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1929), з 1947 працаваў у ім (у 1963—72 прарэктар). Навук. працы па пытаннях ваен.-вет. службы, яе арганізацыі і рабоце ў час Вял. Айч. вайны, гісторыі ваен. ветэрынарыі ў Расіі.

Тв.: Из истории ветеринарного образования в России // Уч. зап. Витеб. вет. ин-та. 1968. Т. 20.

СІПО́ВІЧ Часлаў Вінцэнтавіч (8.12.1914, в. Дзедзіна Міёрскага р-на Віцебскай вобл. — 4.10.1981), бел. рэлігійны і грамадскі дзеяч у эміграцыі. Д-р тэалогіі (1946). У 1928—38 вучыўся ў гімназіі пры Друйскім кляштары айцоў марыянаў, у Віленскім ун-це. Скончыў у Рыме Грыгарыянскі ун-т (1942) і Пантыфікальны ін-т вывучэння Усходу (1946). У 1940 пасвячоны ў ксяндза. З 1947 у Лондане, у 1947—60 і 1970—81 узначальваў Бел. каталіцкую місію ў Вялікабрытаніі. Епіскап каталіцкай царквы ўсх. абраду (1960). У 1960—81 апостальскі візітатар для беларусаў-каталікаў зах. і ўсх. абрадаў у эміграцыі. У 1963—69 генерал ордэна марыянаў, жыў у Рыме. Адзін з ініцыятараў стварэння *Згуртавання беларусаў Вялікабрытаніі*, англа-бел. т-ва (1954), бел. секцыі радыё Ватыкана (1950). Арганізатар Бел. школы імя св. Кірылы Тураўскага (1961), *Беларускай бібліятэкі і музея імя Францішка Скарыны* ў Лондане. На 2-м Ватыканскім саборы (1962—65) абраны ў Кангрэгацыю Усходніх цэркваў. Супрацоўнічаў з час. *«Божым шляхам»* (1947—80) і «The journal of Byelorussian studies» («Часопіс беларускіх даследаванняў», 1965—81). Аўтар артыкулаў па гісторыі хрысціянства на Беларусі, па бел. духоўнай л-ры 17 ст.

Літ.: Беларускія рэлігійныя дзеячы XX ст.: Жыццярысы, мартыралогія, успаміны. Мн.; Мюнхен, 1999. *Л.У.Языковіч.*

СІПУНКУЛІ́ДЫ (Sipunculida), тып беспазваночных жывёл. 1 клас. Каля 320 відаў. Жывуць у морах, у грунце, часта ў норках, ракавінах малюскаў.

Даўж. 1—50 см. Цела чэрвепадобнае, несегментаванае. Пярэдняя ч. мае рот і венчык кароткіх шчупальцаў, можа ўцягвацца ў тулава. За ротам, на спінным баку, знаходзіцца анус. Ёсць другасная поласць цела, або цэлом. Крывяносная і нерв. сістэмы развітыя слаба. Раздзельнаполыя. Кормяцца дробнымі беспазваночнымі і іх рэшткамі.

СІПУ́ХА (Tyto alba), птушка сям. сіпухавых атр. совападобных. 34 падвіды. Пашырана ўсюды, акрамя Антарктыды і Новай Зеландыі, пераважна ў тропіках і субтропіках. Жыве ў парках і насаджэннях з дуплаватымі дрэвамі, у пакінутых пабудовах. На Беларусі рэдкі аселы від, тут праходзіць паўд.-зах. мяжа яе арэала. Вядома па адзінкавых знаходках у паўд.-зах. ч. краіны; занесена ў Чырв. кнігу. T. soumagnei, якая трапляецца на в-ве Мадагаскар, занесена ў Чырв. кнігу МСАП.

Даўж. цела да 43 см, маса да 355 г. Спіна буравата-пясочная з падоўжнымі радамі дробных цёмных і белых крапінак, брушка белавата-вохрыстае з рэдкімі цёмнымі крапінкамі. Тваравы дыск сэрцападобны, амаль белы, каля вачэй іржава-карычневы. Корміцца дробнымі грызунамі, птушкамі, земнаводнымі, насякомымі. Нясе 3—7 (да 12) яец.

СІ́ПЫ (Gyps), род птушак сям. ястрабіных атр. сокалападобных, або драпежных. 4 віды. Найб. пашыраны: С. белагаловы (G. fulvus), трапляецца ў Паўн. Афрыцы, Паўд. Еўропе, Пярэдняй і Сярэдняй Азіі; кумай, або грыф снежны, ці гімалайскі (G. himalayensis), жыве ў высакагорных раёнах Сярэдняй і Цэнтр. Азіі. Афрыканскі ягнятнік (G. coprotheres) — у Чырв. кнізе МСАП.

Даўж. цела да 150 см, маса да 12 кг. Апярэнне ад цёмна-бурага да пясчана-жоўтага. Галава і шыя без пер'яў, укрытая белаватым або шэрым пухам. Дзюба доўгая, моцная. Патурбаваныя птушкі выдаюць доўгае сіпенне (адсюль назва). Кормяцца падлай. У кладцы 1 (зрэдку 2) яйцо.

СІРАКУ́ЗЫ (Syrakusai), старажытнагрэчаскі *поліс* на ПдУ в-ва Сіцылія. Засн. каля 734 да н.э. выхадцамі з *Карынфа*. У 7—6 ст. да н.э. жыхары С. заснавалі шэраг калоній у Сіцыліі: Акра, Камарына, Касмена, магчыма, Эна. У пач. 5 ст. да н.э. гарадскі дэмас перамог гамораў (буйных землеўладальнікаў), якія звярнуліся па дапамогу да тырана Гелона, які ў 485 да н.э. захапіў уладу ў С. і ўсталяваў сваю тыранію. Пры яго пераемніку *Гіероне I* [478—467 да н.э.] С. ўключалі значную частку вострава і ператварыліся ў самую магутную дзяржаву ў Міжземнамор'і. Пасля смерці Гірона I дзяржава распалася, у С. усталявалася рабаўладальніцкая дэмакратыя. У 415—413 да н.э. С. адбілі спробы афінян заваяваць востраў. У 406 да н.э. ўладу ў С. захапіў тыран Дыянісій I,

Сіпуха.

1

2

Сіпы: 1 — белагаловы; 2 — кумай, або грыф снежны, ці гімалайскі.

пры якім С. адбілі агрэсію карфагенян і падпарадкавалі амаль усю Сіцылію. Пасля яго смерці націск Карфагена ўзмацніўся. У канцы 4 ст. да н.э. ў час праўлення *Агафокла* карфагеняне выгнаны з вострава. У перыяд 1-й і 2-й *Пунічных войнаў* С. былі на баку Рыма, потым перайшлі на бок Карфагена. С. — родны горад *Архімеда*, які кіраваў яго абаронай. У 212 да н.э. пасля 2-гадовай асады захоплены, разрабаваны рымлянамі і страцілі б. магутнасць. У рым. эпоху С. — месца знаходжання намеснікаў сіцылійскай правінцыі. З 535 н.э. належалі Візантыі. На месцы стараж. С. пабудаваны сучасны г. Сіракуза (Італія).

СІРАК'ЮС, Сіракузы (Syracuse), горад на ПнУ ЗША, штат Нью-Йорк. Засн. ў 1786, горад з 1847. 152,2 тыс. ж., з прыгарадамі больш за 700 тыс. ж. (1998). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт на канале Эры (злучае Вялікія азёры з Атлантычным ак.). Аэрапорт. Прам-сць: чорная (высакаякасныя сталі і сплавы) і каляровая (пракат і ліццё алюмінію) металургія, эл.-тэхн., радыёэлектронная, аўтамаб., па вытв-сці цеплавога і інш. прамысл. абсталявання, хім. (шчолачы, хлор, фармацэўтычныя прэпараты), харчасмакавая, у т.л. лікёра-гарэлачная. Ун-т.

СІРАНАВЫЯ, сіраны (Sirenidae), сямейства хвастатых земнаводных [па інш. сістэме падатр. (Sirenoidea або Meantes) атр. трахістомавых (Trachystomata)]. 2 роды, 3 віды сіран: вялікі (Siren lacertina), карлікавы (S. intermedia) і паласаты гразевы (Pseudobranchus striatus). Пашыраны ў паўд.-ўсх. ч. Паўн. Амерыкі. Жывуць у азёрах, балотах, зарослых вадаёмах.

Даўж. 15—90 см. Цела доўгае, валлекаватае, з веслападобным хвастом. Маюць толькі пярэднія недаразвітыя канечнасці з 4 або 3 пальцамі. Дыхаюць вонкавымі перыстымі жабрамі і лёгкімі. Вугрападобнымі рухамі яны могуць усвідроўвацца ў глей або ў вільготны грунт. С. уласціва *неатэнія*. Кормяцца дробнымі рыбамі, беспазваночнымі і земнаводнымі.

СІРАНО́ ДЭ БЕРЖЭРА́К (Cyrano de Bergerac) Жан Савіньен (6.3.1619, Парыж — 28.7.1655), французскі пісьменнік. Вучыўся ў Калеж дэ Бавэ пры Парыжскім ун-це (1631—37). Служыў у каралеўскай гвардыі. Удзельнічаў у падрыхтоўцы 1-га этапу *Фронды*. Аўтар камедыі «Асмеяны педант», трагедыі «Смерць Агрыпіны» (надрук. у 1654), санетаў, рандо, памфлетаў, у т.л. вершаванага памфлета «Мазарынада» («Міністр дзяржавы пагарэлай...»), які выкрываў палітыку кардынала Мазарыні і працягваў бурлескную традыцыю П.*Скарона*. Славу С. дэ Б. прынеслі філас. і навук.-фантаст. раманы і адначасова памфлеты «Іншы свет, або Дзяржавы і імперыі Месяца» (надрук. 1657, поўнасцю 1910) і «Дзяржавы і імперыі Сонца» (незавершаны, надрук. 1662), напісаныя ў манеры, блізкай да ісп. *кансептызму*, традыцыі *шахрайскага рамана*, у якіх даў вострую сатыр. карціну жыцця чалавецтва, стварыў інтэлектуальную утопію неабмежаванасці мыслення, свабоды сумлення, свету без войнаў і рэліг. фанатызму. Да рамант. вобраза С. дэ Б. — узнёслага і адначасова скептычнага паэта, высакароднага ў каханні, чалавека, які адмыслова валодае зброяй шпагі і вострага жарту, звярнуўся ў аднайм. камедыі Э.Растан (1898).

Тв.: Рус. пер. — Иной свет, или Государства и империи Луны // Утопический роман XVI—XVII вв. М., 1971. *Г.В.Сініла.*

СІРАТА́ Мікалай Васілевіч (н. 17.6.1941, в. Драмайлаўка Кулікоўскага р-на Чарнігаўскай вобл., Украіна), бел. баяніст, дырыжор. Засл. дз. маст. Беларусі (1986). Скончыў Бел. кансерваторыю (1969). З 1965 артыст Дзярж. нар. аркестра Беларусі. З 1969 выкладчык Гомельскага муз. вучылішча. У 1974—97 муз. кіраўнік Дзярж. акад. нар. хору Беларусі імя Цітовіча. З 1992 выкладчык Мінскага пед. ун-та, кіраўнік створанага ім студэнцкага фальклор. ансамбля «Ярыца» і мужчынскага фальклор. ансамбля «Вячоркі». Аўтар харавых, вак. і інстр. апрацовак бел. нар. песень і мелодый; вак.-харэагр. кампазіцый «Беларускія веснавыя гульні, абрады і карагоды», «Вяночак жніўных песень», «Зімовыя абрады і гульні», «Песні роднага краю» на сл. Я.Купалы, «Беларусь — мая песня» (з І.Кузняцовым), хораў на нар. тэксты, песень на словы У.Карызны, А.Куляшова і інш. *Л.С.Мітаковіч.*

СІРАТА́ Мікалай Мікалаевіч (н. 2.11.1913, С.-Пецярбург), бел. фізік. Акад. Нац. АН Беларусі (1956), д-р фіз.-матэм. н. (1951), праф. (1952). Засл. дз. нав. і тэхн. Беларусі (1968). Скончыў Маскоўскі ін-т сталі (1936). У 1941—54 у Ін-це агульнай і неарган. хіміі АН СССР, адначасова ў маскоўскіх ун-це (1945—56) і ін-це каляровых металаў і золата (з 1951). З 1957 заг. Аддзела фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, у 1963—74 дырэктар Ін-та фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў АН Беларусі (у 1967—75 заг. лабараторыі). Адначасова заг. кафедры ў БДУ (1957—62) і Мінскім пед. ін-це (1963—75). У 1979—88 у маскоўскіх ін-це каляровых металаў і золата і дзярж. ун-це прыродаўладкавання. Навук. працы па тэрмадынаміцы, статыст. фізіцы, фіз. хіміі, фізіцы цвёрдага цела, фізіцы паўправаднікоў і дыэлектрыкаў, магн. з'яў і нізкіх тэмператур. Распрацаваў асновы тэорыі фазавых ператварэнняў, тэорыю ўтварэння метастабільных фаз у адна- і шматкампанентных сістэмах і полімарфізму простых злучэнняў, методыкі вызначэння фанонных спектраў крышталёў па рассеянні халодных нейтронаў. Даследаваў уплыў магн. і эл. палёў на кінетыку крышталізацыі і фазавых пераходаў, хім. сувязь і размеркаванне электронай шчыльнасці ў крышталях, тэрмадынамічныя ўласцівасці шэрагу паўправадніковых злучэнняў. Прапанаваў арыгінальны спосаб атрымання блокаў кубічнага нітрыду бору.

Тв.: Термодинамика и статистическая физика. Мн., 1969; Физико-химическая природа фаз переменного состава. Мн., 1970; Химическая связь и сверхпроводящие свойства соединений // Химическая связь в кристаллах и их физические свойства. Мн., 1976. Т. 2.

Літ.: Н.Н.Сирота: Библиогр. указ. науч. тр. Мн., 1998.

М.М.Сірата.

СІРО́КА (італьян. sciroccо ад араб. шарк — усход), моцны гарачы, сухі і пыльны вецер паўд. румбаў у Міжземнамор'і, які дзьме з боку пустынь Паўн. Афрыкі і Аравійскага п-ва. Над краінамі Афрыкі і Б. Усходу нясе шмат пяску і пылу, на шляху праз Міжземнае м. насычаецца вільгаццю, аднак аказвае высушальны ўплыў на расліннасць узбярэжных раёнаў Францыі, краін Апенінскага і Балканскага п-воў. Часцей назіраецца вясной, дзьме 2—3 дні, павышае т-ру паветра да 35 °С; на падветраных схілах гор часам набывае характар *фёну*.

СІРО́ТКІН Юрый Дзмітрыевіч (14.5.1926, г. Каган Бухарскай вобл., Узбекістан — 29.10.1998), бел. вучоны ў галіне лесаводства. Канд. с.-г. н. (1958), праф. (1982). Засл. лесавод Беларусі (1980). Скончыў Бел. лесатэхн. ін-т (1950). З 1957 у Бел. тэхнал. ін-це. Навук. працы па пытаннях штучнага лесааднаўлення і павышэння прадукцыйнасці лясоў на аснове сучаснага лесазнаўства і лясной інтрадукцыі. Дзярж. прэмія Беларусі 1976.

Тв.: Плоды и семена лиственных древесных растений. Мн., 1967 (разам з М.Дз.Несцяровічам, Н.І.Чакалінскай); Лесные культуры в фитоценотическом аспекте // Ботаника: (Исслед.). Мн., 1980. Вып. 22; Лесные культуры. Мн., 1989 (разам з А.М.Праходскім).

СІРО́ТЫ, катэгорыя сялянскага насельніцтва ў Стараж. Русі. У 11—14 ст. С. звалі сялян-абшчыннікаў, якія не страцілі асабістай свабоды, і насельніцтва княжацкіх вотчын. У Расіі ў 14—15 ст. С. — найб. прыгнечаная катэгорыя сял. насельніцтва. У канцы 14—15 ст. тэрмін «С.» ў актах і граматах выцясняецца тэрмінам «крестьяне». У 16 — пач. 18 ст. ў зваротах да ўрада ці феадала тэрмін «С.» ўжываўся як саманазва сялян, пасадскіх людзей, стралецкіх і салдацкіх жонак, іх дзяцей і г.д.

СІРО́ЦІН Яўхім Ерамеевіч (13.10.1888, с. Салёнае Займішча Чарнаярскага р-на Астраханскай вобл., Расія — 1947),

рускі і бел. фізік і матэматык. Праф. (1918). Скончыў Маскоўскі ун-т (1913). Працаваў у ВНУ Масквы і Кастрамы. З 1922 у БДУ. У 1925 у Кембрыджскім ун-це пад кіраўніцтвам Э.Рэзерфарда вывучаў метады радыеактыўных вымярэнняў. З 1937 у Калінінскім пед. ін-це. Навук. працы па дыферэнцыяльных ураўн., матэм. метадах у фізіцы.

А.А.Гусак.

СІРО́ЦІНА, вёска ў Шумілінскім р-не Віцебскай вобл., каля р. Чарніца, на скрыжаванні аўтадарог на Гарадок, Віцебск, Шуміліна. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 8 км на Пн ад гар. пасёлка і чыг. ст. Шуміліна, 45 км ад Віцебска. 720 ж., 324 двары (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму.

СІРО́ЦІНСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1924—61. Утвораны 17.7.1924 у складзе Віцебскай акругі. Цэнтр — чыг. ст. Сіроціна, з 1927 г.п. *Шуміліна*. 20.8.1924 падзелены на 12 сельсаветаў. З 20.2.1938 С.р. у Віцебскай вобл. У 1941 складаўся з г.п. Шуміліна і 14 сельсаветаў. У ліст. 1961 перайменаваны ў *Шумілінскі раён*.

СІРО́ЦКІ СУД, установа ў Расіі (1775—1917), якая ведала апякунскімі і сіроцкімі справамі асоб гар. саслоўяў. Заснаўвалася пры гар. магістратах, а пасля ўвядзення суд. статутаў (1864) — пры акруговых судах. У склад С.с. ўваходзілі старшыня (гар. галава ці інш. асоба) і члены, якіх выбіралі на сходах купецкага, мяшчанскага і рамеснага саслоўяў на 3 гады. У тых гарадах, дзе не было ўведзена гар. палажэнне, С.с. складаўся з гар. старосты і 2 членаў, якіх выбірала гар. грамадства.

СІРТ ВЯЛІ́КІ, заліў у Міжземным м., другая назва заліва *Сідра*.

СІРФІ́ДЫ, сямейства насякомых, гл. *Журчалкі*.

СІРЫ́ЙСКАЕ НАЦЫЯНА́ЛЬНАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1925—27, нац.-вызв. паўстанне ў Сірыі супраць франц. калан. панавання. Пачалося 18.7.1925 у вобласці Джэбель-Друз пад кіраўніцтвам феадала Султана аль-Атраша. 21 ліп. апалчэнцы разграмілі франц. ваен. атрад, 28 ліп. ўвайшлі ў г. Эс-Сувейда, а 2—3 жн. разграмілі 4-тыс. атрад франц. войск і паўстанне набыло агульнанац. характар. 23 жн. аль-Атраш выдаў маніфест з патрабаваннем поўнай незалежнасці Сірыі і вываду з яе франц. войск. Да паўстання далучылася Партыя народа на чале з Шахбендэрам. У кастр. 1925 вобласць Джэбель-Друз поўнасцю вызвалена ад франц. войск, і паўстанне ахапіла аазіс Гута, дзе знаходзіцца сталіца Сірыі — Дамаск. 18 кастр. паўстанцы ўступілі ў Дамаск, але пад націскам франц. войскаў неўзабаве пакінулі яго і разгарнулі партыз. вайну. Летам 1926 80-тыс. франц. армія рушыла супраць паўстанцаў і да восені задушыла асн. іх ачагі. Апошні апорны пункт паўстанцаў Джэбель-Друз французы захапілі ў чэрв. 1927; аль-Атраш і ч. яго прыхільнікаў перайшлі ў Трансіарданію.

Літ.: Л у ц к и й В.Б. Национально-освободительная война в Сирии (1925—1927 гг.). М., 1964.

СІРЫ́ЙСКАЯ ПУСТЫ́НЯ. У сумежных раёнах Сірыі, Іарданіі, Ірака і Саудаўскай Аравіі. Пл. каля 1 млн. км². Вапняковае плато і лававыя палі выш. 500—800 м, астраўныя горы выш. да 1100 м, многа бяссцёкавых катлавін і сухіх рэчышчаў, паніжэнні з саланчакамі і такырамі, участкі пясчаных і камяністых пустынь. Паверхня зніжаецца да даліны р. Еўфрат і Месапатамскай нізіны. Клімат субтрапічны кантынент., сухі, з цёплай зімой і гарачым летам. На паўн. ускраіне сярэдняя т-ра студз. 6,9 °С, ліп. 29,2 °С. Ападкаў 100—150 мм за год. Разрэджаная эфемерная і палынова-кусцікавая расліннасць, па далінах часовых вадацёкаў зараснікі тамарыску. Качавая жывёлагадоўля.

СІРЫНГАМІЭЛІ́Я [ад грэч. syrinx (syringos) трубка, трубчастая поласць + myelos мозг], хранічная хвароба нерв. сістэмы з пераважным пашкоджаннем спіннога мозга. Характарызуецца разрастаннем *гліі* і ўтварэннем поласцей у шэрым рэчыве. Найчасцей выяўляецца пасля траўмаў, інфекцый і інш. Тыповая праява С. — пакутлівы боль (звычайна з аднаго боку ў вобласці верхніх канечнасцей, шыі, лапаткі). Прыкметы: расстройствы болевай і тэмпературнай адчувальнасці, парэзы, паралічы, атрафія мышцаў рук, ног. Лячэнне тэрапеўт., фізіятэрапеўтычнае.

СІ́РЫУС, α Вялікага Пса, самая яркая зорка неба, -1,46 візуальнай *зорнай велічыні*. Свяцільнасць у 28 разоў большая за сонечную. Адлегласць ад Сонца 2,7 пк. С. — *падвойная зорка*; яе кампанент Сірыус Б (у 10 тыс. разоў менш яркі, чым С.) — першы выяўлены белы *карлік*.

СІ́РЫЯ (Сурыя), Сірыйская Арабская Рэспубліка (Аль-Джумхурыя аль-Арабія ас-Сурыя), дзяржава ў Зах. Азіі. Мяжуе на Пн з Турцыяй, на У з Іракам, на Пд з Іарданіяй, на З з Ізраілем, Ліванам і абмываецца Міжземным морам. Пл. 185,2 тыс. км², у т.л. 1370 км² акупіравана ў 1967 Ізраілем (Галанскія вышыні). Нас. 16,3 млн. чал. (2000). Афіц. мова — арабская. Сталіца — г. *Дамаск*. Падзяляецца на 18 мухафаз. Нац. свята — Дзень эвакуацыі (17 крас.).

Дзяржаўны лад. С. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1973. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт, якога выбірае парламент і зацвярджае ўсенародны рэферэндум на 7 гадоў. Вышэйшы орган заканад. ўлады — аднапалатны парламент (250 дэпутатаў), які выбіраецца ўсеагульным галасаваннем на 4 гады, выканаўчы орган — Савет Міністраў на чале з прэм'ер-міністрам, якога прызначае прэзідэнт.

Прырода. Большая частка тэр. С. раўнінная ці платопадобная (верхняя частка *Месапатамскай нізіны* на У, *Сірыйская пустыня* на ПдУ). На З невял. горныя хрыбты: Эд-Друз (да 1800 м), Антыліван з масівам Эш-Шэйх, або Хермон (выш. 2814 м), Эль-Гарбі (да

Герб і сцяг **Сірыі**.

1830 м), Ансарыя і інш. Паміж хрыбтом Ансарыя (на З) і гарамі Эз-Завія (на У) тэктанічная ўпадзіна Эль-Габ. Уздоўж Міжземнага м. вузкая нізінная і раўнінная паласа. Карысныя выкапні: нафта, газ, марганцавыя і поліметал. руды, фасфарыты і інш. Клімат на З субтрапічны, міжземнаморскі; на У кантынент., засушлівы. Сярэдняя т-ра студз. на ўзбярэжжы 12 °С, на У 4 °С, ліп. адпаведна 26 і 34 °С. Ападкаў на большай частцы тэр. 100—200 мм, на зах. схілах гор да 1000 мм і больш за год (выпадаюць з ліст. да крас.). Рэк мала. Найб. рэкі: на У — Еўфрат з прытокамі і Тыгр, на З — Эль-Асі. Расліннасць пе-



раважна паўпустынная і пустынная, на З у гарах хмызнякі, лясы (3% тэр.) з вечназялёнага дубу, алепскай хвоі і інш. Жывёльны свет пустынь і паўпустынь. З драпежнікаў звычайныя паласатая гіена, воўк, шакал, каракал, ліс-фенек; з капытных — антылопы і дзікі асёл. Шмат грызуноў і паўзуноў. Ёсць запаведнікі і заказнікі.

Да арт. **Сірыя**. Міжземнаморскае ўзбярэжжа.

Насельніцтва. Каля 90% складаюць сірыйскія арабы (сірыйцы). Жывуць таксама курды (каля 6,5%, пераважна на У), армяне (каля 3%, у гарадах), выхадцы з суседніх краін, чэркесы, туркмены, цыганы і інш. Мусульман 83% (з іх 82% суніты, 18% шыіты), хрысціян каля 14% (правасл., католікі, мараніты і інш.). Сярэдняя шчыльн. 88 чал. на 1 км^2. На ўзбярэжжы і ў далінах рэк, у перадгорных аазісах шчыльн. перавышае 300 чал. на 1 км^2, у пустынях і паўпустынях каля 10 чал. на 1 км^2 і менш, ёсць качэўнікі і паўкачэўнікі. Натуральны прырост каля 3% за год. У гарадах жыве 52% насельніцтва. Найб. гарады (тыс. ж., 1994): Дамаск — 1550, Халеб — 1591, Хомс — 644, Латакія — 307, Хама — 229. У сельскай гаспадарцы занята 40% працаздольных, у прам-сці — 20%, у абслуговых галінах — 40%. Шмат сірыйцаў працуе ў нафтаздабыўных краінах Персідскага заліва.

Гісторыя. С. — асяродак стараж. цывілізацый. У панятце «гістарычная С.», т.зв. Вял. С., да пач. 20 ст. ўключаліся тэр. сучасных С., Лівана, Іарданіі і Ізраіля. Прыналежнасць найб. стараж. яе насельніцтва не вызначана. У сярэдзіне 4-га тыс. да н.э. тэр. С. засялілі народы семіцкага паходжання. Яны заснавалі гарады-дзяржавы, найб. значны з якіх — Эбла — дасягнуў росквіту ў 26—23 ст. да н.э. Каля 2000 да н.э. ў паўд.-зах. ч. С. пасяліліся *ханаанеі*, на ўзбярэжжы — *фінікійцы*; каля 1700 да н.э. на тэр. С. з'явіліся *амарыты*, каля 1500 да н.э. — *арамеі*, у 12 ст. да н.э. — *яўрэі*. У 16—13 ст. да н.э. С. — аб'ект барацьбы паміж Стараж. Егіптам, *Хецкім царствам* і *Мітані*. У 11—8 ст. да н.э. існавала *Дамаскае царства*, якое ў 732 да н.э. заваявана *Асірыяй*, у 612 да н.э. *Вавілоніяй*. З 539 да н.э. ў складзе *Ахеменідаў дзяржавы*. У 333 да н.э. С. заваяваў *Аляксандр Македонскі*. Яго пераемнікі *Селеўкіды* кіравалі С. ў 312—64 да н.э. На працягу наступных 700 гадоў С. была ў складзе Рымскай, потым Візант. імперый. Палесцінская частка Вял. С. — радзіма хрысціянства, якое ў 4 ст. н.э. стала дзярж. рэлігіяй. У 630-я г. С. заваявалі арабы (гл. *Арабскія заваяванні*). З гэтага часу іслам прыняты большасцю насельніцтва, а араб. мова стала адзінай мовай народа С. У 661—750 С. — паліт. і культ. цэнтр *Амеядаў халіфата*, пасля ўсталявання ў 750 *Абасідаў халіфата* цэнтр дзяржавы перамясціўся ў Ірак. У 10—11 ст. С. пад уладай розных мусульм. дынастый. У канцы 11 ст. ў С. ўварваліся крыжакі, якія захапілі прыбярэжныя р-ны. У канцы 12 ст. егіпецкі султан *Салах ад-дзін* нанёс крыжакам паражэнне і стаў правіцелем б.ч. тэр. С. У 1260—1516 С. пад уладай егіпецкіх *мамлюкаў*. У 1516 С. заваявалі туркі-асманы, і яна на 400 гадоў увайшла ў склад Асманскай імперыі. Вял. геагр. адкрыцці і новыя марскія шляхі ў краіны Усходу паменшылі значэнне С. як цэнтра транзітнага гандлю. У 2-й пал. 19 ст. ў С. ўзнік культ.-асветніцкі рух «Нахда» («Адраджэнне»), да пач. 20 ст. яна была адным з цэнтраў барацьбы за араб. незалежнасць. У 1-ю сусв. вайну сірыйцы разам з інш. араб. народамі ўзнялі паўстанне супраць туркаў і падтрымалі Вялікабрытанію ў абмен на яе падтрымку ідэі араб. незалежнасці. Але пасля вайны *Ліга Нацый* падзяліла ў 1920 Вял. С. на мандатныя тэрыторыі паміж Францыяй і Вялікабрытаніяй; да Францыі адышла тэр. сучаснай С. Франц. панаванне, палітыка яе адміністрацыі, скіраваныя на поўнае падпарадкаванне С., выклікалі шэраг паўстанняў. Найб. з іх — *Сірыйскае нацыянальнае паўстанне 1925—27* — прымусіла франц. ўлады да ўступак. У маі 1930 выдадзена канстытуцыя, якая абвясціла С. рэспублікай пры захаванні вярх. улады Францыі. Ва ўмовах 2-й сусв. вайны (у чэрв. 1941 брыт. войскі і часткі «Свабоднай Францыі» ген. Ш. дэ Голя выбілі з тэр. С. армію рэжыму «Вішы»), франц. адміністрацыя 27.9.1941 заявіла аб прызнанні незалежнасці С., 23.12.1943 падпісана адпаведнае франка-сірыйскае пагадненне. У жн. 1943 выбраны першы прэзідэнт незалежнай С. — Ш.Куатлі. Суверэннай дзяржавай С. стала пасля вываду франц. і брыт. войск

Да арт. **Сірыя**. Ландшафт на захадзе краіны.

Да арт. **Сірыя**. Старая крэпасць у г. Хомс.

17.4.1946 — гэты дзень адзначаецца ў С. як нац. свята.

Як і інш. араб. краіны, С. выступіла супраць рашэння ААН пра падзел Палесціны і ўтварэнне дзяржавы Ізраіль, сумесна з імі прыняла ўдзел у *араба-ізраільскай вайне 1948—49*. Ваен. няўдачы пахіснулі аўтарытэт урада С. У сак. 1949 група афіцэраў здзейсніла дзярж. пераварот, паклаўшы пачатак 20-гадоваму перыяду ваен. пераваротаў. Імкнучыся рэалізаваць ідэю адзінства ўсіх арабаў, С. ў лют. 1958 аб'ядналася з Егіптам у Аб'яднаную Араб. Рэспубліку (ААР). Спробы кіруючых колаў Егіпта ўсталяваць кантроль над адзінай дзяржавай прывялі ў вер. 1961 да выхаду С. з ААР і абвяшчэнні яе Сірыйскай Араб. Рэспублікай. Ваен. пераварот 8.3.1963 прывёў да ўлады *Партыю арабскага сацыялістычнага адраджэння* (Баас). Баасісцкі ўрад перадаў пад кантроль дзяржавы б.ч. прам-сці і знешняга гандлю. У выніку паражэння С. ў араба-ізраільскай вайне 1967 ч. сірыйскай тэр., у т.л. Галанскія вышыні, захоплена Ізраілем. У ліст. 1970 да ўлады ў партыі і краіне прыйшоў ген. Х.*Асад* (у сак. 1971 ён абраны прэзідэнтам С.). Пасля араба-ізраільскай вайны 1973 С. вярнула ч. акупіраваных тэрыторый, але большая ч. Галанскіх вышынь засталася пад кантролем Ізраіля, які ў 1981 афіцыйна іх анексіраваў. З 1976 С. ажыццяўляе ваен. прысутнасць у Ліване, у 1982 удзельнічала на яго тэр. ў вайне супраць Ізраіля. У 1979 С. асудзіла мірныя дагаворы паміж Егіптам і Ізраілем (гл. *Кэмп-Дэвідскія пагадненні 1978*). У час *ірана-іракскай вайны 1980—88* урад С. падтрымаў Іран, а ў час *Кувейцкага крызісу 1990—91* сірыйскія войскі ўдзельнічалі ў антыіракскай кааліцыі. Гал. мэта знешняй палітыкі С. — вяртанне Галанскіх вышынь і ўрэгуляванне *блізкаўсходняга канфлікту*. Аднак сірыйска-ізраільскія перамовы 1990-х г. па гэтых пытаннях скончыліся безвынікова. Пасля смерці ў чэрв. 2000 Асада прэзідэнтам стаў яго сын Б.Асад. С. — чл. ААН (з 1945), Лігі араб. дзяржаў (з 1945). Дыпламат. адносіны С. з Рэспублікай Беларусь усталяваны ў жн. 1993.

Паліт. партыі: Партыя араб. сацыяліст. адраджэння, узначальвае Прагрэс. нац. фронт (ПНФ), у які таксама ўваходзяць Араб. сацыяліст. саюз, Рух араб. сацыялістаў, Сірыйская камуніст. партыя і інш.; усе арг-цыі, якія не ўваходзяць у ПНФ, забаронены.

Гаспадарка. С. — аграрна-індустр. дзяржава сярэдняга ўзроўню развіцця. Валавы ўнутр. прадукт 41,7 млрд. дол. (1998), каля 2600 дол. на душу насельніцтва; на сельскую гаспадарку прыпадае каля 28%, на прам-сць — каля 20%, на сферу паслуг — каля 52%. У эканоміцы вядучая роля дзярж. сектара, на долю якога прыпадае каля 50% нац. даходу, 75% кошту прамысл. прадукцыі і 70% асн. сродкаў вытворчасці. Дзяржава цалкам кантралюе сферу фінансаў, горназдабыўную прам-сць, энергетыку, чыг. і авіяц. транспарт. Прыватны сектар дамінуе ў сельскай гаспадарцы, рознічным гандлі, сферы паслуг, аўтатранспарце, жыллёвым будаўніцтве. Сельская гаспадарка — асн. галіна эканомікі. Характэрны сялянскія гаспадаркі, ёсць кааператывы і буйныя дзярж. гаспадаркі. У выніку агр. рэформы буйное землеўладанне абмежавана, памешчыцкія землі выкуплены і размеркаваны за плату сярод сялян. Пад ворывам і шматгадовымі насаджэннямі каля 6 млн. га, у т.л. каля 1 млн. га арашаецца; каля 8 млн. га (тэр. пустынь і паўпустынь) выкарыстоўваецца пад пашу. Штогод збіраюць 4—5 млн. т пшаніцы, каля 2 млн. т ячменю, 200 тыс. т кукурузы, 300 тыс. т сачавіцы, 1,5 млн. т цукр. буракоў, 400 тыс. т вінограду, 350 тыс. т апельсінаў, 430 тыс. т памідораў. Асн. земляробчыя раёны на ўзбярэжжы, у далінах рэк, перадгор'ях. Тэхн. культуры (бавоўнік, цукр. буракі і трыснёг, тытунь) вырошчваюць на арашальных землях. Асн. раён пладаводства (абрыкосы, інжыр, цытрусавыя), агародніцтва, вінаградарства, бахчаводства — на ПнЗ. Там жа аліўкавыя гаі. Жывёлагадоўля пераважна экстэнсіўная, у значнай ступені качавая і паўкачавая. У 1997 пагалоўе (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы — 905, авечак — 15 000, коз — 1200. Гадуюць таксама вярблюдаў, коней, аслоў і мулаў. Птушкагадоўля (у 1997 — 21 млн. курэй). Марское і рачное рыбалоўства. У прам-сці пераважаюць сярэднія і дробныя прадпрыемствы. Гарнарудная прам-сць прадстаўлена здабычай нафты і прыроднага газу, фасфарытаў, жал. руды, серы, каменнай солі, буд. матэрыялаў. Штогод здабываюць каля 30 млн. т нафты і 5 млрд. м^3 газу. Асн. раёны здабычы на ПнУ (Тэль-Румайлан, Карачук, Сувайдзія і інш.). Электраэнергія (у 1998 — 17,5 млрд. кВт·гадз) прыкладна пароўну выпрацоўваецца на ГЭС (буйнейшы Еўфрацкі гідраэнергетычны комплекс) і ЦЭС на нафце і газе. Найбольш прадпрыемстваў харч. і лёгкай прам-сці працуюць на ўласнай сыравіне. Развіты бавоўнаачышчальная, тэкст. і швейная (Дамаск, Халеб, Латакія, Хама, Хомс і інш.), харч. (мукамольная, мясаперапрацоўчая, алейная, вінаробная, цукр., кансервавая, безалкагольных напіткаў; Дамаск, Халеб, Латакія і інш.), гарбарна-абутковая, тытунёвая галіны. Важнае значэнне маюць нафтаперапр. (Баніяс, Хомс, Эль-Камышлы), хім. (Хомс), металургічная (Хама, Хомс), цэм. (Дамаск, Халеб, Хама, Хомс) галіны прам-сці. Ёсць з-ды трактаразборачны (Халеб) і электраматораў (Латакія), ф-кі мінер. угнаенняў (Хомс) і дываноў (Халеб), прадпрыемствы ваен. прам-сці. У Дамаску электракабельны з-д, прадпрыемствы электроннай, фармацэўтычнай і шкляной прам-сці. Шырока развіты саматужны выраб парчы, біжутэрыі, маст. рэчаў з медзі, золата, серабра, дрэва і інш.; апрацоўка скур і ручное дыванаткацтва. Транспарт чыг., аўтамаб., марскі, трубаправодны. Даўж. чыгунак 1998 км, аўтадарог 41,4 тыс. км, унутр. водных шляхоў (рэкі Еўфрат і Эль-Асі) 970 км, нафтаправодаў 1304 км (у т.л. транзітныя з Ірака і Саудаўскай Аравіі), прадуктаправодаў 515 км. У краіне 134 тыс. легкавых, 219 тыс. грузавых аўтамабіляў і аўтобусаў, 5 буйных аэрапортаў, у т.л. міжнар. ў Дамаску і Халебе. Гал. марскія парты Латакія, Баніяс, Тартус. Выкарыстоўваюцца таксама парты Лівана. У 1998 экспарт склаў 4,2 млрд. дол., імпарт 5,7 млрд. дол. У экспарце пераважаюць нафта і нафтапрадукты (каля 40% па кошце), тэкстыль,

Да арт. **Сірыя**. Мініяцюра «Ушэсце святой Марыі» з Евангелля Рабулы. 586.

Сірыя. Мячэць Амеядаў у Дамаску.

адзенне і скураныя вырабы (каля 30%), некат. харч. тавары, тытунь і інш.; у імпарце — машыны, абсталяванне, трансп. сродкі, металы, хімікаты, драўніна. Гал. гандл. партнёры: Італія, Германія, Францыя, Турцыя, Ліван, інш. арабскія краіны. С. — краіна развітога турызму. Штогод наведвае каля 2 млн. турыстаў пераважна з Турцыі і арабскіх краін. Асн. аб'екты — узбярэжжа Міжземнага м., Дамаск, Халеб, рэшткі ант. г. Тадмар (Пальміра). У 1998 турызм прынёс даход у 1,36 млрд. дол. Грашовая адзінка — сірыйскі фунт.

Узброеныя сілы. Уключаюць рэгулярныя ўзбр. сілы (складаюцца з сухап. войск, ВПС і ППА, ВМС; каля 320 тыс. чал.) і ваенізаваныя фарміраванні (жандармерыя) — 8 тыс. чал. (2000). Вярх. галоўнакамандуючы — прэзідэнт. Камплектаванне паводле прызыву. У сухап. войсках 215 тыс. чал., 4650 танкаў, каля 4,7 тыс. баявых машын пяхоты і інш. браніраваных машын, больш за 1,9 тыс. самаходных гармат і гармат на буксірнай цязе, 480 рэактыўных сістэм залпавага агню і інш. У ВПС і ППА каля 100 тыс. чал., у т.л. ў ППА каля 60 тыс. чал., 589 баявых самалётаў, 72 баявыя верталёты, каля 450 зенітных ракетных комплексаў. У ВМС 6 тыс. чал., 10 баявых караблёў, 18 катэраў, у т.л. 10 ракетных, 24 верталёты.

Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Ад эпохі неаліту вядомы наскальныя выявы ў Дэмір-Капу, каменныя і гліняныя антрапаморфныя статуэткі, ляпная размаляваная кераміка, паселішчы 5—4-га тыс. да н.э. (Угарыт, Тэль-Халаф). На тэр. С. развіваліся стараж. маст. культуры Б. Усходу: вавілона-асірыйская, фінікійская, хецкая і інш. Іх спалучэнне з мясц. традыцыямі надало своеасаблівасць мастацтву стараж. С. — сір. перыяду эліністычнага, рым. [Дура-Еўрапас, Тадмар (*Пальміра*), Бусра] і ранневізант. (Русафа, Кальб-Лузех) мастацтва. У 4—6 ст. склалася мясц. ранневізант. маст. традыцыя. Культавая архітэктура адметная наватарскімі манум. формамі (манастырскі комплекс Кал'ат-Семан, створаны вакол калоны св. Сімяона Слупніка), дамінуючай стала 3-нефавая базіліка з высокім сярэднім нефам, з аркадамі на нізкіх слупах (Кальб-Лузех), купальныя базілікі розных тыпаў (царква ў Русафе). Выяўл. мастацтва таго часу прадстаўлена разьбой па камені і косці, мазаікамі падлог, экспрэсіўнай кніжнай мініяцюрай (Евангелле Рабулы). Пасля араб. заваявання (7 ст.) С. — адзін з цэнтраў станаўлення *арабскай культуры*. У часы праўлення Амеядаў пачалася стылістычная адаптацыя стараж. мастацтва і дойлідства да сярэдневяковай маст. стылістыкі ісламу. У архітэктуры на аснове стараж.-рым. і візант. буд. вопыту распрацаваны тып шматкалоннай мячэці, перабудаванай з хрысц. базілікі. Захоўваліся запазычанні з ордэрнай сістэмы, канструкцыі арачных і купальных перакрыццяў. У інтэр'еры храма цэнтр. месца заняў вял. двор, завершаны з супрацьлеглага боку галерэяй на аркадах; у гал. сцяне рабілася свяшчэнная ніша — міхраб. Узорнай стала *Амеядаў мячэць* у Дамаску. Свецкая рэзідэнцыя халіфа (палац у пустыні) мела выгляд крэпасці, абнесенай абарончымі сценамі, з квадратным дваром пасярэдзіне. Фасад палаца меў брамы, завершаныя зубчастымі байніцамі, машыкулямі (замак у Каср аль-Хейр аль-Гарбі). У аздабленні будынкаў захаваліся эліністычныя і ранневізант. традыцыі (мазаікі мячэці Амеядаў), зарадзілася сістэма арнаменту — *арабескі*. У 10 ст. сфарміравалася аблічча сярэдневяковага араб. горада з падзелам на ўмацаваныя кварталы. З'явіліся кварталы-кірмашы з крытымі вуліцамі, караван-сараі, медрэсэ (ан-Нурыя ў Дамаску), марыстаны (бальніцы; Нур-ад-дзіна ў Дамаску), лазні з купаламі. На тэр. С. захаваліся руіны крыжацкіх замкаў (Крак-дэ-Шэвалье). Пры Айюбідах (з 1187) высокага тэхн. ўзроўню дасягнулі і фартыфікацыйныя збудаванні (цытадэлі ў Дамаску, Халебе). Пашырыліся формы ярусных мінарэтаў, аздабленне сцен нішамі, арнаментальнымі рамамі. У пластычных мастацтвах развіваліся арнамент і каліграфія. У 13—14 ст. дасягнула росквіту кніжная мініяцюра (рукапісы «Каліла і Дымна» і інш.). У дэкар.-прыкладным мастацтве вылучаліся кераміка з размалёўкай люстрам, маст. вырабы са шкла (з эмалевымі размалёўкамі) і металу, аздобленыя чаканкай, сярэбранай інкрустацыяй і гравіроўкай, разьба па дрэве (міхрабы, мінбары), маст. тканіны. У асманскі перыяд (1516—1918) мастацтва развівалася пад уплывам тур. дойлідства: мячэці квадратныя ў плане, з вял. сферычным купалам, 4 мінарэтамі па вуглах (мячэць Такія Сулейманія ў Дамаску, 16 ст., арх. Сінан), паліхромная кераміка з буйным кветкавым узорам. Асабліва пышным стаў арх. дэкор. Набылі пашырэнне 1-камерныя маўзалеі «цюрбе». Для традыц. нар. жылля на Пд ужывалі блокі з вулканічнай лавы, на Пн будавалі купальныя жытлы з цэглы-сырцу. У нар. мастацтве пашыраны натуралізаваны расл. арнамент на керамічы, тканінах, метале, ткацтва бязворсавых дываноў з характэрнымі для пэўнай мясцовасці арнаментам і колеравай гамай. Узнікла інкрустацыя па дрэве серабром, перламутрам і вярблюджай косцю (мінбары, столікі, скрынкі і інш.). У 1920—30-я г. будавалі ў духу еўрап. стыляў, ішла мэтанакіраваная рэканструкцыя гарадоў. У 1950-я г. ўзмацніліся пошукі аб'яднання сучасных канструкцый з нац. формамі (арх. Вахбі аль-Харыры і інш.). Мастакі С. (Т.Тарык, М.Кірша, М.Джалаль) успрынялі традыцыі еўрап. рэалізм. мастацтва, франц. акад. школы і імпрэсіянізму. Адзін з вядучых манументалістаў С. — А.М.Шама (вучань рас. мастака А.Дайнекі). Сярод найб.

Да арт. **Сірыя**. Керамічныя ваза і збанок з Ракі. 13 ст.

Сірыя. Цытадэль у г. Халеб. 13—16 ст.

Сірыя. Традыцыйныя жытлы ў г. Халеб.

значных мастакоў 2-й пал. 20 ст.: Л.Каялі, А.Катраміз, Х.Замрык, Н.Набаа, А.Нашваці, І.Хімат, Н.Шаўра і інш. Развіваюцца традыц. віды нар. мастацтва: вышыўка шоўкам, серабром, залатам па аксаміце, воўне і бавоўне, пляценне з каляровай саломы, апрацоўка металу, дрэва, інкрустацыя перламутрам, косцю, каляровымі пародамі дрэва, кераміка.

Да арт. **Сірыя.** Т. Тарык. Савет халіфа аль-Мамуна. 1918.

Літ.: Новейшая история арабских стран Азии, 1917—1985. М., 1988; Сирийская Арабская Республика. М., 1997; Корнилов В. Секретная война: Хроника сирийской кампании 1941 г. // Крылья Родины. 1994. № 7—8; Яшкин Г.П. Под жарким солнцем Сирии // Воен.-ист. журн. 1998. № 4; Сидорова Н.А., Стародуб Т.Х. Города Сирии. М., 1979; Богданов А.А. Художники Сирии. М., 1981.

М.С.Ваітовіч, Г.С.Смалякоў (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *У.С.Кошалеў* (гісторыя), *І.Г.Елісееў* (узброеныя сілы), *Я.Ф.Шунейка* (архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва).

СІРЭ́Н (Siren) Іохан (27.5.1889, г. Ілімхярмя, Фінляндыя — 5.3.1961), фінскі архітэктар; лідэр фін. *неакласіцызму* 1920—30-х г. Вучыўся ў політэхн. ін-це ў Хельсінкі, выкладаў у ім (праф. 1931—57). Для пабудоў С. характэрны строгая сіметрыя, маналітнасць аб'ёмна-прасторавых кампазіцый, спрошчаная трактоўка ордэрных элементаў (будынак парламента ў Хельсінкі, 1927—31).

СІРЭ́НА (франц. sirène ад грэч. seirēn сірэна, міфічная дзева, якая прываблівала мараходаў сваімі спевамі), прылада для атрымання гукавых ці ультрагукавых ваганняў шляхам перарывання струменя паветра ці пары.

Паводле прынцыпу работы С. бываюць дынамічныя (вярчальныя) і пульсуючыя. Больш пашыраны дынамічныя, якія падзяляюцца на восевыя і радыяльныя. Першыя складаюцца з 2 дыскаў з адтулінамі, праз якія прапускаецца струмень газу пад ціскам. Пры вярчэнні аднаго дыска (ротара) адносна другога (статара) у моманты супадзення адтулін струмень праходзіць, у моманты перакрыцця — спыняецца. У радыяльных сістэмах замест дыскаў ужываюцца кааксіяльныя пустыя цыліндры ці поршні са шчылінамі. Выкарыстоўваюцца на маяках, суднах, у сістэмах апавяшчэння аб небяспеках і інш. Гл. таксама *Газаструменныя выпрамяняльнікі.*

СІРЭ́НЫ, у старажытнагрэчаскай міфалогіі напаўжанчыны-напаўптушкі, якія сваімі чароўнымі спевамі заманьвалі мараплаўцаў да прыбярэжных скал, дзе тыя і гінулі. У пераносным сэнсе С. — спакуслівыя прыгажуні, якія зачароўваюць і прывабліваюць людзей сваім голасам.

СІРЭ́НЫ (Sirenia), атрад млекакормячых. 3 сям., 3 роды, 5 відаў. Вядомы з эацэну. Продкамі, верагодна, былі наземныя звяры, блізкія да хобатных, даманаў і капытных. Пашыраны ў прыбярэжных водах мораў і ў буйных рэках трапічнай ч. Сусв. ак. Актыўныя пераважна ўначы. Усе віды занесены ў Чырв. кнігу МСАП.

Даўж. цела 2,5—5,8 м (у вымерлай *марской каровы* да 10 м). Маса да 650 кг, марской каровы да 4 т. Цела масіўнае, верацёнападобнае. Шыя кароткая і тоўстая, рухомая. Хваставы плаўнік гарызантальны. Пярэднія канечнасці ў выглядзе ластаў, рухомых у плечавым і локцевым суставах. Расліннаедныя. Нараджаюць 1 (радзей 2) дзіцяня. Іл. гл. да арт. *Дзюгонь, Ламанціны, Марская карова.*

СІРЭ́Т (рум. Siret), Серэт, рака на У Румыніі (вярхоўі на тэр. Украіны), левы прыток р. Дунай. Даўж. 726 км, пл. бас. 45 тыс. км^2. Пачынаецца ва Усх. Карпатах, цячэ пераважна па раўнінах Малдовы. Асн. прытокі: Сучава, Малдова, Бістрыца, Тротуш, Бузэў (справа), Бырлад (злева). Веснавое разводдзе, летнія дажджавыя паводкі. Сярэдні расход вады 185 м^3/с. У бас. С. — ГЭС (пераважна на р. Бістрыца). Суднаходная ў ніжнім цячэнні. У даліне С. — г. Бакэў (Румынія).

СІСАКЯ́Н Нарайр Марціросавіч (25.1.1907, г. Аштарак, Арменія — 12.3.1966), расійскі біяхімік. Акад. АН СССР (1960, чл.-кар. 1953). Акад. АН Арм. ССР (1965). Скончыў Маскоўскую с.-г. акадэмію імя К.А.Ціміразева (1932). З 1935 у Ін-це біяхіміі АН СССР. Навук. працы па вывучэнні ролі ферментаў у працэсах абмену рэчываў, біяхіміі засухаўстойлівасці і глебавым жыўленні раслін, тэхн. біяхіміі, касм. біялогіі. Дзярж. прэмія СССР 1952. Яго імем названы кратэр на Месяцы.

Тв.: Биохимия обмена веществ. М., 1954.
Літ.: Н.М.Сисакян. М., 1967.

СІСЛЕ́Й (Sisley) Альфрэд (30.10.1839, Парыж — 29.1.1899), французскі жывапісец, адзін з вядучых майстроў *імпрэсіянізму*. Па паходжанні англічанін. Вучыўся ў майстэрні Ш.Глейра ў Парыжы (1860—63). Зазнаў уплыў К.Каро, К.Манэ. Адлюстроўваў пераважна ваколіцы Парыжа, прыроду Іль-дэ-Франса. Адметныя рысы яго жывапісу — работа на пленэры, сціпласць матываў, вытанчаная гама светлых тонаў, кампазіцыйная завершанасць і манументальная раўнавага. Раннім пейзажам уласціва некаторая змрочнасць: «Вясковая вуліца ў Марлоце» (1866), «Від на Манмартр» (1869). Каля 1870 ён асвятляе палітру, пачынае супрацьпастаўляць мазкі, ва ўраўнаважаных і лёгкіх па фактуры творах значнае месца займае неба і выяўленне неабсяжнай прасторы: «Баржы на канале Сен-Мартэн» (1870), «Лувесьен.

А.Сіслей. Паводка ў Пор-Марлі. 1876.

Сеўрская дарога» (1873), «Кузня ў Марлі» (1875), «Паводка ў Пор-Марлі» (1876), «Снег у Лувесьене» (1878). Пасля 1880 фактура яго твораў стала больш пастознай: «Белы крыж у Сен-Маме» (1884), «Сен-Маме» (1885), «Мост у Марэ, эфект навальніцы» (1887), «Стагі сена ў Марэ, эфект раніцы» (1891), «Канал у Луэне» (1892), «Царква ў Марэ пасля дажджу» (1894).

Літ.: Бродская Н. Картины Сислея в Эрмитаже. Л., 1963. *С.У.Пешын.*

Ж.Ш.Сісмандзі.

СІСМАНДЗІ́ (Sismondi) Жан Шарль Леанар Сімонд дэ (9.5.1773, Жэнева — 25.6.1842), швейцарскі эканаміст і гісторык. Скончыў Жэнеўскі ун-т. Жыў у Францыі, Вялікабрытаніі, Італіі, у 1798 вярнуўся ў Швейцарыю. З 1833 член франц. Акадэміі маральных і паліт. навук. У працы «Аб камерцыйным багацці» (1803) выступаў за палітыку неўмяшання дзяржавы ў эканоміку. Потым кардынальна змяніў сваю пазіцыю: сцвярджаў, што неўмяшанне дзяржавы ў эканам. справы прыводзіць да масавых бедстваў («Новыя прынцыпы палітычнай эканоміі», 1819). Асуджаў неабмежаваную канкурэнцыю і неравытворчасць тавараў, якія звязваў з падзелам працы і буйнамаштабнай вытв-сцю. Лічыў, што дробная вытв-сць здольна забяспечыць раўнавагу паміж вытв-сцю і спажываннем і абмежаваць канкурэнцыю. У працах па гісторыі Францыі і Італіі імкнуўся гістарычна абгрунтаваць свае эканам. погляды. Эканам. вучэнне С. паўплывала на тэорыі *сацыялізму* і ідэі *народніцтва*.

СІ́СТАЛА (ад грэч. systolē сціскванне, скарачэнне), рытмічнае сціскванне (звужэнне) поласцей сэрца, якое выклікаецца скарачэннем мышцаў перадсэрдзяў ці жалудачкаў. Адначасова памяншаецца аб'ём крыві, што ў іх знаходзіцца. Пры С. перадсэрдзяў кроў паступае з іх у жалудачкі, пры С. жалудачкаў нагнятаецца ў артэрыяльную сістэму. У чалавека пры рытме 75 скарачэнняў за 1 мін С. перадсэрдзяў доўжыцца 0,1 с, жалудачкаў — 0,3 с, за адну С. сэрца выкідвае ў крывацёк 60—70 мл крыві (сісталічны, ці ўдарны, аб'ём), за суткі — 7,2 тыс. л (больш за 100 тыс. скарачэнняў). Па дзеянні С. процілеглая *дыястале*. Паслядоўныя С. і дыястала складаюць сардэчны цыкл. *С.С.Ермакова.*

СІСТЭ́МА (ад грэч. systēma складзенае з частак), цэласная сукупнасць узаемазвязаных элементаў. У якасці С. разглядаюцца сукупнасць рэчаў, уласцівасцей і адносін, складаныя аб'екты, часткі прыроднага і тэхнагеннага асяроддзя, якія характарызуюцца шматузроўневасцю і іерархічнасцю пабудовы: напр., горныя С., С. рэк, азёр, мораў, жывёльнага і расліннага свету, С. гарадоў і інш. Адрозніваюць матэрыяльныя і ідэальныя С. Да матэрыяльных адносяць С. ўсіх узроўняў арганізацыі і форм руху матэрыі, уключаючы С. жывой і нежывой прыроды, С. эканам., паліт., прававых і інш. грамадскіх адносін. Ідэальныя С. ўключаюць канкрэтныя, якія складаюцца з пачуццёвых вобразаў і выяўляюцца, напр., у творах мастацтва, і абстрактныя, якія ўваходзяць у склад гіпотэз, тэорый і інш. С. падзяляюць таксама на адкрытыя і закрытыя, статычныя і дынамічныя, жорсткадэтэрмінаваныя і імавернасныя, натуральныя і штучныя і інш. Усім тыпам С. уласціва пэўнае падабенства характарыстык. Элементы С. могуць быць аднародныя і неаднародныя па сваіх якасцях. Комплексы разнародных элементаў у С. з'яўляюцца падсістэмамі. Элементы С. адносна самастойныя, што выяўляецца ў захаванні сваіх якасцей пры змене структуры С. і магчымасці пераходу ў інш. С. Самастойнасць элементаў залежыць ад ступені складанасці С.: чым больш складаная С., тым мацней узаемазалежныя элементы. Цэласнасць С. забяспечваецца яе структурай — устойлівым, упарадкаваным спосабам сувязі паміж элементамі. Структура С. складаецца ў працэсе ўзаемадзеяння элементаў і адказвае за ўзнаўленне С. і яе адаптацыю да ўмоў асяроддзя. Змены ў асяроддзі прыводзяць да пераўтварэння структуры С., а часам да замены папярэдніх элементаў якасна новымі (гл. *Ізамарфізм і гомамарфізм*). С. характарызуюцца 3 тыпамі ўласцівасцей: субстратнымі, інтэгратыўнымі і функцыянальнымі. Субстратныя ўласцівасці (маса, памер, матэрыяльны састаў) абумоўлены матэрыяльным складам С., інтэгратыўныя — залежаць ад спосабу сувязі паміж элементамі, функцыянальныя — вызначаюць функцыі С. ў знешнім асяроддзі.

Першыя ўяўленні пра С. як аснову ўпарадкаванасці і цэласнасці быцця ўзніклі ў ант. філасофіі. Б.Спіноза, Г.Лейбніц і прадстаўнікі навук. сістэматыкі 17—18 ст. прапаноўвалі прыродазнаўчыя сістэмна-анталагічныя канцэпцыі светабудовы. Прынцыпы сістэмнай прыроды ведаў у ням. класічнай філасофіі распрацоўвалі І.Кант, Ф.Шэлінг, Г.Гегель. У 2-й пал. 19 — 20 ст. даследаваліся спецыфіка тэарэт. ведаў як С. (неакантыянства), метады пабудовы лагічных і фармалізаваных С. (неапазітывізм). Сістэмныя даследаванні праводзяцца ў межах *агульнай тэорыі сістэм* і спец. тэорый: *сістэмнага падыходу, сістэмнага аналізу, сістэматэхнікі, кібернетыкі, сінергетыкі* і інш.

Літ.: Системные исследования. М., 1969; Морозов В.Д., Морозов В.В. Диалектика: системы и развитие. Мн., 1978; Аверьянов А.Н. Системное познание мира. М., 1985; Система. Симметрия. Гармония. М., 1988; Хакен Г. Информация и самоорганизация: Макроскопич. подход к сложным системам: Пер. с англ. М., 1991; Князева В.Н., Курдюмов С.П. Законы эволюции и самоорганизации сложных систем. М., 1994; Спицнадель В.Н. Основы системного анализа. СПб., 2000.

В.Дз.Марозаў.

СІСТЭ́МА ў тэхніцы, сукупнасць узаемазвязаных тэхн. аб'ектаў (прылад, машын, механізмаў), а таксама носьбітаў інфармацыі, працэсаў, элементаў і інш., аб'яднаных адзінай мэтай і агульным алгарытмам функцыянавання.

С. ў кібернетыцы і вылічальнай тэхніцы — сукупнасць апаратных і праграмных сродкаў *вылічальных сістэм*, у т.л. базавых праграмных сродкаў (напр., *аперацыйных сістэм*, комплексаў праграм для рашэння канкрэтных прыкладных задач). Адрозніваюць С. аўтаматычныя і аўтаматызаваныя (з удзелам чалавека), адаптыўныя, саманавучальныя, самаарганізавальныя і інш. Найб. пашыраны С. інфармацыйныя, пошукавыя, аўтам. кіравання, аўтаматызацыі навук. даследаванняў, навук.-тэхн. эксперыментаў і выпрабаванняў, аўтаматызаванага праектавання, кіравання прадпрыемствамі і тэхнал. працэсамі, апрацоўкі відарысаў, сігналаў, распазнавання вобразаў, тэхн. зроку і інш.

Літ.: Острейковский В.А. Теория систем. М., 1997. *М.П.Савік.*

СІСТЭ́МА АДЗІ́НАК фізічных велічынь, сукупнасць асноўных і вытворных адзінак некаторай *сістэмы фізічных велічынь*. За асн. (незалежныя) выбіраюцца адзінкі, якія лёгка ўзнаўляюцца ў выглядзе дакладных *эталонаў* (напр., *метр, секунда*). Вытворныя адзінкі вызначаюцца праз асн. з дапамогай матэм. суадносін, якія выражаюць фіз. законы ці паказваюць сувязь паміж *фізічнымі велічынямі*.

Звычайна выбіраецца паслядоўнасць суадносін, у якой кожны наступны выраз мае толькі адну новую фіз. велічыню. Гэта дазваляе вызначыць кожную вытворную адзінку праз сукупнасць раней вызначаных адзінак, а ў выніку — праз асн. адзінкі сістэмы. Першая С.э. — *метрычная сістэма мер* (асн. адзінкі метр і *кілаграм*), у сярэдзіне 19 ст. К.Ф.*Гаўс* і В.Э.*Вебер* стварылі адну з *абсалютных сістэм адзінак* (міліметр, міліграм, секунда), прынцып пабудовы якой увасоблены пры ўвядзенні *СГС сістэмы адзінак*. У 1901 італьян. вучоны Дж.Джорджы прапанаваў С.а. МКС (метр, кілаграм, секунда), якая разам з С.а. МКСА (1 м, 1 кг, 1 с, *ампер*) і МКСК (1 м, 1 кг, 1 с, *кельвін*) стала асновай для стварэння *Міжнароднай сістэмы адзінак* (СІ). Гл. таксама *Натуральная сістэма адзінак*.

Літ.: Стоцкий Л.Р. Физические величины и их единицы: Справ. М., 1984; Сена Л.А. Единицы физических величин и их размерности. 3 изд. М., 1989; Деньгуб В.М., Смирнов В.Г. Единицы величин: Словарь-справ. М., 1990. *А.І.Болсун.*

СІСТЭ́МА АДЛІ́КУ ў механіцы, сукупнасць сістэмы *каардынат* і сінхранізаваных гадзіннікаў, звязаных з выбраным целам адліку, у адносінах да якога вызначаецца рух або раўнавага матэрыяльнага пункта ці механічнай сістэмы.

Целам адліку можа быць пэўны матэрыяльны аб'ект (напр., пункт зямной паверхні, самалёт, Зямля, Сонца ці цэнтр Га-

лактыкі), характар руху якога вызначае ступень неінерцыяльнасці сістэмы. У якасці г а д з і н і к а (спосабу адліку часу) выбіраюць пэўны перыядычны працэс (ваганні маятніка, рух Зямлі вакол сваёй восі і інш.). Спосабы апісання руху цела адносна выбранай С.а. вывучаюцца ў *кінематыцы*, дзе ўсе С.а. лічацца раўнапраўнымі. Пры рашэнні задач *дынамікі* перавага аддаецца *інерцыяльнай сістэме адліку*, адносна якой ураўненні руху маюць больш просты выгляд. Пры неабходнасці ўліку сіл інерцыі (рух цяжкавагавых паяздоў, балістычных ракет і інш.) выкарыстоўваецца *неінерцыяльная сістэма адліку*. *А.І.Болсун.*

СІСТЭ́МА АЎТАМАТЫЗАВА́НАГА ПРАЕКТАВА́ННЯ (САПР), комплекс апаратна-праграмных сродкаў для *аўтаматызацыі праектавання* машын, абсталявання, збудаванняў і інш. З дапамогай САПР ажыццяўляецца распрацоўка праектных рашэнняў на ўсіх стадыях цыкла існавання аб'екта: ад разліку характарыстык запраектаванага вырабу да падрыхтоўкі тэхн. дакументацыі і аналізу вынікаў выпрабаванняў. САПР дазваляе павялічыць якасць канструктарскай дакументацыі і скараціць тэрміны праектавання. Класіфікацыя САПР залежыць ад тыпу вытв-сці і віду праектных аб'ектаў.

САПР уключае забеспячэнні: тэхн. сродкі (ЭВМ, камп'ютэрныя сеткі, графапабудавальнікі, сродкі кадзіравання графічнай інфармацыі і інш.), матэм. (тэорыі праектавання вырабаў, матэм. мадэлі, алгарытмічныя мовы, тэрміналогію, метады і алгарытмы сінтэзу, аптымізацыі і рашэння праектных задач і інш.), праграмнае (аперацыйныя сістэмы, транслятары з алгарытмічных моў, пакеты прыкладных праграм), інфармацыйнае (базы даных і сродкі кіравання імі) і інш.

На Беларусі навук. даследаванні і распрацоўкі ў галіне САПР вядуцца ў Ін-тах тэхн. кібернетыкі і механікі машын Нац. АН, Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі, БПА і інш.

Літ.: Автоматизация проектирования технологических процессов и средств оснащения. Мн., 1997; Норенков И.П. Основы автоматизированного проектирования. М., 2000. *У.І.Махнач.*

СІСТЭ́МА ВЕРШАСКЛАДА́ННЯ, гл. ў арт. *Вершаскладанне.*

СІСТЭ́МА ДРУКА́РСКІХ МЕР, т ы п а м е т р ы я, сістэма вымярэння памераў, прынятая ў паліграфіі і выдавецкай справе. Створана ў 1737 франц. друкаром і словалітчыкам П.С.Фурнье, удасканалена Ф.А.Дзідо. З дапамогай С.д.м. вымяраюцца *кеглі* шрыфтоў, наборных лінеек, прагальных матэрыялаў, фарматы паласы набору; адбіўкі, водступы, палі, аборкі, міжлітарныя і міжрадковыя разрадкі, памеры калонак, ілюстрацый.

У аснову С.д.м. пакладзены друкарскі *пункт*, роўны $^1/_{72}$ франц. цалі, якая складае 27,06 мм. Для практычных вымярэнняў і большасці разлікаў 1 пункт прымаецца роўным 0,376 мм. 12 пунктаў складаюць 1 цыцэра, 4 цыцэра роўныя 1 квадрату, або 48 пунктам. Паміж адзінкамі С.д.м. і метрычнай існуюць суданосіны: 1 цыцэра = 4,51 мм, 1 квадрат = 18,04 мм, 1 мм = 2,66 пункта. Гэтая С.д.м. выкарыстоўваецца ў большасці еўрап. краін, у т.л. на Беларусі, Расіі і інш. краінах СНД. У ЗША, Вялікабрытаніі і інш. англамоўных краінах выкарыстоўваецца англамер. варыянт С.д.м., у аснову якога пакладзены друкарскі пункт, роўны $^1/_{72}$ т.зв. каралеўскай цалі (0,3514 мм); у іх фотанаборных машынах кегль шрыфту амаль на 7% меншы, чым у сістэме Дзідо.

Літ.: Воскресенский М.И., Колосов А.И. Наборные процессы и переработка текстовой информации. М., 1989.

У.М.Сацута.

СІСТЭ́МА ЗЕМЛЯРО́БСТВА, комплекс узаемазвязаных агратэхн., меліярац. і арганізацыйна-гасп. мерапрыемстваў па эфектыўным выкарыстанні зямлі. Забяспечвае расшыранае ўзнаўленне *ўрадлівасці глебы*, атрыманне ўсё большых ураджаяў і выключае негатыўны ўплыў на навакольнае асяроддзе. Адрозніваюць С.з. прымітыўныя (лядна-агнявая, аблогавая, лесапольная і інш.), экстэнсіўныя (папарныя) і інтэнсіўныя. На Беларусі з канца 3-га — пач. 2-га тысячагоддзяў да н.э. была пашырана лядна-агнявая С.з. (лес высякалі, дрэвы спальвалі, а зямлю выкарыстоўвалі пад ворыва); урадлівасць глебы зніжалася і аднаўлялася толькі пад уплывам прыроднай расліннасці. Аблогавая С.з. ўзнікла пры скарачэнні плошчы вольных зямель, неабходнасці вяртання старых участкаў, якія зноў выкарыстоўвалі пад пасевы, а потым запускалі пад *аблогу*. Пазней, пры выкарыстанні лесапольнай С.з., плошча ўзараных зямель была павялічана, тэрмін аблогі і лесаполя скараціўся, урадлівасць не аднаўлялася. У час феадалізму панавалі экстэнсіўныя С.з. Папарная С.з. прадугледжвала чаргаванне культур — *папар*, азімыя, яравыя. У канцы 19 ст. ўзнікла і пашыралася травапольная С.з. (гал. недахоп — увядзенне ўсюды бабова-збожжавых сумесей і змяшэнне пасеваў збожжавых культур). Сучасныя інтэнсіўныя С.з. (палепшаная, пладазменная, з кармавымі севазваротамі і інш. спецыялізаваныя) уключаюць *севазвароты* з *травасеяннем*, культ. *лугаводства* з перыядычным перазалужэннем лугоў, *апрацоўку глебы* з чаргаваннем плужных і бясплужных апрацовак, рацыянальнае ўжыванне арган. і мінер. угнаенняў, *вапнаванне глебы*, барацьбу з хваробамі, шкоднікамі і пустазеллем, рэгуляванне воднага рэжыму глеб і інш.

СІСТЭ́МА КАМП'Ю́ТЭРНАГА ЗРО́КУ, комплекс апаратна-праграмных сродкаў для ўводу даных з лічбавых оптыка-электронных прылад (фотаапаратаў, тэлевізійных ці відэакамер) і далейшай іх апрацоўкі з дапамогай *вылічальнай тэхнікі*.

На С.к.з. грунтуецца тэхналогія аўтам. ўстанаўлення адпаведнасці назіранага аб'екта (у т.л. 3-мернага) аб'ектам пэўнага віду ці класа (гл. *Распазнаванне вобразаў*). Асобны выпадак — аптычнае распазнаванне тэкставай (сімвальнай) інфармацыі, уведзенай з дапамогай *сканераў* і далейшае праграмнае пераўтварэнне даных з графічнай формы ў тэкставую. С.к.з. выкарыстоўваецца для кіравання робатамі, у лятальных і касм. апаратах, ахоўных прыладах і сістэмах і інш.

На Беларусі даследаванні па праблемах С.к.з. вядуцца ў Ін-тах Нац. АН, БДУ, Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі, Ваен. акадэміі.

Літ.: Системы технического зрения. Л., 1988; Хорн Б.К.П. Зрение роботов: Пер. с англ. М., 1989; Абламейко С.В., Лагуновский Д.М. Обработка изображений: технология, методы, применение. Мн., 2000. *С.У.Абламейка.*

СІСТЭ́МА КІРАВА́ННЯ, сукупнасць аб'екта кіравання і прылад, што падтрымліваюць (змяняюць) структуру і рэжым функцыянавання аб'екта адпаведна зададзенай праграмы (мэты кіравання). У склад С.к. ўваходзяць таксама інфарм. каналы прамой і адваротнай сувязі. Падзяляюцца на біял., тэхн. і сац.-эканамічныя. Асн. задачы: збор і перадача інфармацыі аб аб'екце кіравання, перапрацоўка інфармацыі, выдача кіруючых уздзеянняў на аб'ект кіравання. Вывучае С.к. *кібернетыка*.

Даследаванне С.к. ажыццяўляецца шляхам пабудовы матэм. мадэляў (гл. *Гульняў тэорыя, Масавага абслугоўвання тэорыя, Распазнаванне вобразаў*). Пабудова С.к. ажыццяўляецца з улікам прынцыпу аптымальнасці (гл. *Аптымальная сістэма*). Пры функцыянаванні С.к. істотнае значэнне мае фактар нявызначанасці, калі стан сістэмы можа змяняцца ў выніку розных уздзеянняў, выкліканых унутр. ці знешнімі прычынамі, што вырашаецца шляхам надання сістэме ўласцівасцей *адаптацыі* (адаптыўныя сістэмы) да ўмоў функцыянавання. Да С.к. адносяцца: у тэхніцы — сістэмы аўтам. кіравання складаных тэхн. аб'ектаў (напр., металарэзных станкоў, самалётаў, робатаў і інш.); у біялогіі — жывыя арганізмы рознага ўзроўню арганізацыі, у сацыяльна-эканам. развіцці — прамысл. прадпрыемствы, грамадскія арг-цыі, а таксама *аўтаматызаваныя сістэмы кіравання* гэтых аб'ектаў.

На Беларусі даследаванне і праектаванне С.к. праводзіцца ў Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН, ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі, Ваен. акадэміі, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Літ.: Кузин Л.Т. Основы кибернетики. Т. 1—2. М., 1973—79; Гайшун И.В. Многопараметрические системы управления. Мн., 1996; Гринберг А.С., Савич Л.Н., Тимошек Л.Е. Прикладные системы обработки информации в управлении. Ч. 1. Мн., 1998; Афанасьев В.Н., Колмановский В.Б., Носов В.Р. Математическая теория конструирования систем управления. 2 изд. М., 1998. *А.А.Несянчук, М.П.Савік.*

СІСТЭ́МА ЛІЧЭ́ННЯ, спосаб (сістэма) запісу *лікаў*. Гл. ў арт. *Лічэнне.*

СІСТЭ́МА МО́ВЫ, 1) сукупнасць элементаў кожнай натуральнай мовы (фанем, марфем, лексічных адзінак, мадэлей сказаў), што звязаны паміж сабой устойлівымі адносінамі і ўтвараюць структураваную адзінае цэлае, якое служыць падставай для пабудовы маўленчых выказванняў. С.м. ўключае: *узроўні мовы*, адзінкі мовы, парадыгматычныя (гл. *Парадыгматыка*) і сінтагматычныя (гл. *Сінтагматыка*) адносіны, знакавасць мовы, форму, структуру і субстанцыю, знешнія і ўнутр. сувязі ў мове, *сінхранію* і *дыяхранію*, аналіз і сінтэз і інш. С.м. складаецца з некалькіх падсістэм (фаналагічнай, лексічнай і інш.),

якім уласціва розная ступень адкрытасці або закрытасці. Найб. закрытая падсістэма мовы — фаналагічная, найб. адкрытая — лексічная. 2) Сукупнасць моўных форм, што ўтвараюць пэўную грамат. катэгорыю (напр., сістэма склонаў, сістэма форм катэгорыі ладу і інш.).

Літ.: Солнцев В.М. Язык как системно-структурное образование. 2 изд. М., 1978.

А.Я.Міхневіч.

СІСТЭ́МА (ПЕРЫ́ЯД) ГЕАЛАГІ́ЧНАЯ, асноўная адзінка міжнар. стратыграфічнай шкалы, якая адпавядае прыроднаму этапу (геал. перыяду) у развіцці зямной кары і арган. свету Зямлі (гл. *Геахраналогія*) і аб'ядноўвае адклады, што ўтварыліся за гэты перыяд; састаўная частка *эратэмы*. Вылучана 12 сістэм, якія ўтвараюць *фанеразой* (кембрыйская, ардовікская, сілурыйская, дэвонская, кам.-вуг., пермская, трыясавая, юрская, мелавая, палеагенавая, неагенавая і антрапагенавая, або чацвярцічная, гл. адпаведныя арт.) і вендская сістэма ў познім пратэразоі (гл. *Стратыграфічная шкала*). Кожная сістэма падзяляецца на 3, радзей на 2 аддзелы. На Беларусі ёсць адклады ўсіх сістэм. Пры вылучэнні сістэм крытэрыямі з'яўляюцца істотныя змены ў складзе арган. свету, якія выражаюцца ў развіцці новых груп фауны і флоры вял. сістэм. рангу (надсямействаў, сямействаў, родаў). Кожнай сістэме ўласцівы пэўны характар *літагенезу*. Адклады адных сістэм макс. пашыраны (дэвонскай, мелавой, антрапагенавай), другіх вядомы на абмежаванай тэрыторыі (ардовікскай, сілурыйскай і інш.). З адкладамі многіх сістэм звязаны карысныя выкапні (напр., нафта, каменная і калійныя солі, гаручыя сланцы, даламіты, мінер. воды і расолы — з адкладамі дэвонскай; бурыя вуглі — кам.-вуг. і неагенавай; бурштын — палеагенавай і неагенавай; торф, буд. матэрыялы — антрапагенавай).

С.А.Кручак.

СІСТЭ́МА ПРА́ВА, пабудова нацыянальнага права, якая заключаецца ў раздзяленні адзіных па прызначэнні ў грамадстве ўнутрана ўзгодненых норм на пэўныя часткі — галіны права, якія ў сваю чаргу падзяляюцца на ін-ты права. Напр., галіна цывільнага права падзяляецца на ін-ты права ўласнасці, абавязацельнае права, аўтарскае права і сумежныя правы, спадчыннае права і інш. Дакладна распрацаваная С.п. — неабходная аснова для эфектыўнай работы па *сістэматызацыі заканадаўства*, павышэнні прававой культуры. С.п. розных краін могуць адрознівацца пэўнымі асаблівасцямі, абумоўленымі гіст. ўмовамі, нац. традыцыямі, узроўнем развіцця прававой культуры.

Г.А.Маслыка.

СІСТЭ́МА РАЎНКІЁРА, экалагічная класіфікацыя раслін, заснаваная на месцазнаходжанні пупышак узнаўлення ў адносінах да паверхні глебы і наяўнасці адпаведных прыстасаванняў для перажывання неспрыяльнай пары года (зімы або засушлівага перыяду). Прапанавана дацкім эколагам і геабатанікам К.Раўнкіерам (1905, 1907). Адпаведна С.Р. адрозніваюць 6 груп жыццёвых форм раслін: эпіфіты — расліны, якія не маюць каранёў у глебе; фанерафіты — надземныя расліны, у якіх пупышкі ўзнаўлення знаходзяцца на парастках, размешчаных вертыкальна; хамефіты — паверхневыя расліны, у якіх пупышкі ўзнаўлення размешчаны высока над зямлёй; гемікрыптафіты — расліны, што ўтвараюць дзірван, у якіх пупышкі ўзнаўлення знаходзяцца на ўзроўні глебы ці пад яе паверхняй; крыптафіты — расліны, або іх часткі (клеткі), у якіх зімой пупышкі ўзнаўлення знаходзяцца ў глебе (геафіты) ці пад вадой (гідрафіты); тэрафіты — аднагадовыя расліны, у якіх жыццёвы цыкл заканчваецца за адзін вегетацыйны сезон (неспрыяльную пару года перажываюць у выглядзе насення).

СІСТЭ́МА САЦЫЯ́ЛЬНАЯ, цэласнае, структурна ўпарадкаванае ўтварэнне, якое складаецца з індывідаў і сац. супольнасцей, аб'яднаных сац. сувязямі і ўзаемаадносінамі. Істотнымі рысамі С.с., як і кожнай *сістэмы*, з'яўляюцца цэласнасць і інтэгральнасць. Новая якасць, якую яна ўтварае, не зводзіцца механічна да сумы якасцей яе элементаў (інтэгральны эфект), а ўласцівасці і заканамернасці элементаў часам выяўляюцца інакш, чым пры самаст. існаванні. У шырокім сэнсе С.с. — усё *грамадства* з яго падсістэмамі (сац. ін-тамі, арг-цыямі і інш. структурнымі фарміраваннямі). На эмпірычным узроўні — пэўная сац. *супольнасць* ці *арганізацыя*, для якой характэрны такія сістэмаўтваральныя якасці, як *мэта, іерархія, кіраванне*, этн. і нац. супольнасці, *дзяржава*. С.с. можна лічыць і кожную асобу, калі разглядаць яе з пункту гледжання характарыстык, якія выяўляюцца ў працэсе сац. узаемаадносін. У параўнанні з біял., тэхн. і інш. сістэмамі С.с. максімальна складаная, паколькі яе асн. элемент (чалавек) валодае суб'ектыўнасцю і вял. дыяпазонам выбару паводзін. Аб'ектыўная складанасць С.с. прапарцыянальная множнасці яе элементаў, колькасці ўзроўняў і падсістэм, разнастайнасці сувязей паміж імі, ступені аўтаномнасці яе частак. Кожнай канкрэтнай С.с. уласціва іерархічнасць пабудовы — сістэмы ніжэйшага ўзроўню паслядоўна ўключаюцца ў сістэмы вышэйшага. Яна арганічна звязана са знешнім асяроддзем, выконвае строга абмежаваныя функцыі. Спосабам рэгулявання шматузроўневай іерархіі, забеспячэння сувязей паміж рознымі ўзроўнямі С.с. з'яўляецца кіраванне. Эфектыўны метад кіравання С.с. — мэтанакіраваны ўплыў на яе сістэмаўтваральныя элементы і сувязі.

Літ.: Аверьянов А.Н. Система: филос. категория и реальность. М., 1976; Афанасьев В.Г. Системность и общество. М., 1980; Социология: Основы общей теории. М., 1996.

І.В.Катляроў.

СІСТЭ́МА ЎДЗЕ́ЛУ, скупка галаўной кампаніяй кантрольнага пакета акцый інш. кампаній, у т.л. даччынага т-ва, якое, у сваю чаргу, набывае акцыі інш. т-ваў. У выніку С.ў. ствараецца шматступенная залежнасць прадпрыемстваў ад галаўной кампаніі, што ў многіх дзяржавах забаронена або строга абмежавана антыманапольным заканадаўствам.

СІСТЭ́МА ФІЗІ́ЧНЫХ ВЕЛІЧЫ́НЬ, сукупнасць узаемазвязаных *фізічных велічынь*, што ўключае асн. (незалежныя) і вытворныя велічыні і выкарыстоўваецца ў пэўнай галіне прыродазнаўства. Абазначаецца сімваламі асн. велічынь (гл. *Размернасць* у фізіцы) і дазваляе вызначыць кожную вытворную фіз. велічыню праз асноўныя на падставе ўраўненняў сувязі, якая існуе паміж імі. Напр., LMT — у механіцы і LMTI — у электрадынаміцы, дзе L — даўжыня, M — маса, T — час, I — сіла току (асн. велічыні сістэмы адпаведна). Выбар С.ф.в. вызначае ўвядзенне адпаведных *сістэм адзінак* фіз. велічынь.

СІСТЭ́МА «ЧАЛАВЕ́К-МАШЫ́НА», складаная сістэма, у якой чалавек-аператар (ці група аператараў) узаемадзейнічае з тэхн. аб'ектам (напр., пракатным станам, транспартным сродкам, ЭВМ) у працэсах прамысл. вытв-сці, кіравання, апрацоўкі інфармацыі і інш. Праблемы С. «ч.-м.» вывучае *эргатыка*.

Асн. праблемы стварэння і выкарыстання С. «ч.-м» — улік магчымасцей чалавека, аптымальнае размеркаванне функцый паміж чалавекам і машынай, узгадненне рэжымаў і ўмоў іх супольнага функцыянавання. Для праектавання С. «ч.-м.» распрацоўваюць мадэлі, якія апісваюць складаныя чалавека-машынныя алгарытмы рашэння задач. Рэалізуюць такія алгарытмы з дапамогай спец. пакетаў прыкладных праграм. У С.«ч.-м.» на аснове дасягненняў інжынернай псіхалогіі карыстаюцца візуальным і аўдыявізуальным абменам інфармацыяй, пры якім распазнаюцца таксама моўныя паведамленні чалавека (гл. *Распазнаванне вобразаў, Распазнаванне вуснай мовы*), генерыруюцца адказы ў гукавой і візуальнай форме. Гл. таксама *Сістэматэхніка, Эрганоміка*.

На Беларусі праблемы С.«ч.-м.» даследуюцца ў Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН, Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі, БПА і інш.

Г.Р.Маньшын.

СІСТЭМАТЫЗА́ЦЫЯ ЗАКАНАДА́ЎСТВА, упарадкаванне і прывядзенне ў пэўную сістэму нарматыўных актаў, якое заключаецца ў іх удасканаленні, вызваленні ад устарэлых і супярэчных паміж сабой норм, стварэнні новых актаў, зборнікаў, збораў законаў. Мае на мэце забяспечыць узгадненне прававых норм, выключыць раздробненасць і мноства актаў, якія назапашваюцца ў працэсе прыватворчасці, аблегчыць іх выкарыстанне ў практыцы прымянення закону, павысіць прававую культуру грамадзян. С.з. рэалізуецца ў формах *кадыфікацыі* заканадаўства і яго *інкар-*

парацыі. Пад тэрмінам «С.з.» разумеецца таксама дзейнасць органаў улады, кіравання, юстыцыі, суда і пракуратуры па бягучым уліку дзеючых нарматыўных актаў. Усе дзеючыя заканад. акты Рэспублікі Беларусь падлягаюць уключэнню ў Звод законаў, які з'яўляецца афіц. выданнем і падтрымліваецца ў кантрольным стане. Падрыхтоўка і падтрыманне Зводу ў кантрольным стане ажыццяўляюцца Нац. цэнтрам законапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. *Г.А.Маслыка.*

СІСТЭМА́ТЫКА (ад грэч. systēmatikos упарадкаваны, які адносіцца да *сістэмы*) у біялогіі, раздзел *біялогіі*, які займаецца апісаннем, пазначэннем і *класіфікацыяй* усіх існуючых і вымерлых арганізмаў, устанаўленнем роднасных сувязей паміж іх асобнымі групамі (таксонамі) — *відамі, родамі, сямействамі* і інш. Грунтуецца на даных усіх раздзелаў біялогіі, асабліва на *эвалюцыйным вучэнні*. Дазваляе арыентавацца ў мностве існуючых відаў жывёл (каля 1,5 млн.), раслін (каля 350—500 тыс. відаў) і мікраарганізмаў, а таксама вымерлых відаў. Складае базу для генетыкі, біяхіміі, біягеаграфіі, экалогіі, палеанталогіі і інш. біял. навук. С. асн. груп арган. свету (*пракарыёт* і *эўкарыёт*) маюць адны асновы, задачы і шмат агульнага ў метадах даследавання, аднак розным раздзелам С. ўласцівы шэраг асаблівасцей, звязаных са спецыфікай розных груп арганізмаў. Як асн. раздзелы вылучаюць С. жывёл і С. раслін (вывучаюць разнастайнасці жывёльных і расл. арганізмаў). Асн. задачы С. — вызначэнне шляхам параўнання індывід. і спецыфічных асаблівасцей кожнага віду і надвідавых таксонаў, іх месца ў эвалюцыі арган. свету, выяўленне агульных уласцівасцей у розных таксонах.

С. імкнецца стварыць усеагульную і натуральную (філагенет.) класіфікацыйную сістэму арган. свету, падпарадкавання таксонаў рознага рангу — ад віду да сістэм. *царства* і надцарства, вызначыць месца кожнага віду арганізма ў гэтай сістэме. С. часта падзяляюць на *таксаномію*, разумеючы тэорыю класіфікацыі арганізмаў, і ўласна С. ў шырокім сэнсе. Зрэдку тэрмін «таксаномія» выкарыстоўваюць як сінонім С.

Асновы С. як навукі закладзены працамі англ. прыродазнаўца Дж.Рэя і асабліва К.*Лінея*. Вучэнне Ч.*Дарвіна* надало С. эвалюц. змест.

Літ.: Майр Э. Принципы зоологической систематики: Пер. с англ. М., 1971; Тахтаджян А.Л. О состоянии и перспективах развития систематики в СССР // Успехи совр. биологии. 1972. Т. 73, вып. 2; Меликян А.П. Цели и задачи современной систематики растений. М. 1984. *Л.В.Кірыленка.*

СІСТЭМАТЭ́ХНІКА, навукова-тэхнічная дысцыпліна, якая вывучае пытанні праектавання, стварэння, выпрабавання і эксплуатацыі складаных тэхн. і інфарм. сістэм на аснове ЭВМ. Грунтуецца на метадах матэм. логікі і статыстыкі, камбінаторыкі, тэорыях алгарытмаў, гульняў, сітуацый, масавага абслугоўвання, інфармацыі і інш.

Састаўныя часткі С. — іерархічная структура складаных сістэм і арганізацыя іх праектавання, аналіз, мадэліраванне, сінтэз і аптымізацыя сістэм. Складанымі сістэмамі лічаць аб'екты (сістэмы), састаўныя часткі (падсістэмы) якіх разглядаюць як асобныя сістэмы, аб'яднаныя пэўнымі сувязямі (суадносінамі) ці пэўнымі прынцыпамі. Пры распрацоўцы такіх сістэм вырашаюць праблемы, звязаныя з уласцівасцямі падсістэм, а таксама з заканамернасцямі функцыянавання ўсяго аб'екта.

Літ.: Дружинин В.В., Конторов Д.С. Системотехника. М., 1985. *М.П.Савік.*

СІСТЭ́МНЫ АНА́ЛІЗ, сукупнасць метадаў і сродкаў даследавання складаных, шматузроўневых сістэм, аб'ектаў, працэсаў, якія даюць магчымасць рыхтаваць і абгрунтоўваць рашэнні па складаных праблемах паліт., ваен., сац., эканам., навук. і тэхн. характару. Асновай С.а. лічаць агульную тэорыю *сістэм* і *сістэмны падыход*. Працэс С.а. складаецца з пастаноўкі праблемы, вызначэння мэты і крытэрыяў ацэнкі; структурнага аналізу доследнай сістэмы; распрацоўкі канцэпцыі развіцця сістэмы; падрыхтоўкі магчымых варыянтаў; непасрэднага аналізу выбраных варыянтаў і іх вынікаў. Гал. працэдура С.а. — пабудова абагульненай мадэлі (ці мадэляў), якая адлюстроўвае ўсе фактары і ўзаемасувязі рэальнай сітуацыі. Атрыманая мадэль даследуецца з мэтай высвятлення блізкасці выніку пэўнага альтэрнатыўнага варыянта да жаданага, параўнальных затрат рэсурсаў па кожным варыянце, ступені ўспрымальнасці мадэлі да непажаданых знешніх уздзеянняў. Абапіраецца на шэраг матэм. метадаў і сучасных метадаў *кіравання*. Выкарыстоўваецца ў *праграмаванні* і перспектыўным планаванні, пры рашэнні задач праектавання аўтаматызаваных сістэм кіравання, праектаванні і рэканструкцыі гарадоў і інш. У 1972 у Лаксенбургу (Аўстрыя) створаны Міжнар. ін-т прыкладнога С.а., у рабоце якога ўдзельнічаюць 12 краін. Ін-т працуе над праблемамі, якія патрабуюць міжнар. супрацоўніцтва (ахова навакольнага асяроддзя, асваенне рэсурсаў сусв. акіяна, карыстанне пагранічнымі воднымі басейнамі і інш.).

Літ.: Клиланд Д., Кинг В. Системный анализ и целевое управление: Пер. с англ. М., 1974; Диалектика и системный анализ. М., 1986; Перегудов Ф.И., Тарасенко Ф.П. Введение в системный анализ. М., 1989; Философия и методология науки. М., 1996. *М.В.Тараткевіч.*

СІСТЭ́МНЫ ПАДЫХО́Д, кірунак метадалогіі навук. пазнання і сац. практыкі, у аснове якога разгляд аб'ектаў як *сістэм*. Спецыфіка С.п. ў тым, што ён арыентуе даследаванне на раскрыццё цэласнасці аб'екта, выяўленне разнастайных тыпаў сувязі складанага аб'екта і звядзенне іх да адзінай тэарэт. карціны. У наш час С.п. займае адно з вядучых месц у навук. пазнанні. Перадумовай пранікнення яго ў навуку з'явіўся перш за ўсё пераход да новага тыпу навук. задач: у многіх галінах навукі гал. сталі праблемы арг-цыі і функцыянавання складаных аб'ектаў; пазнанне ўсё больш аперыруе сістэмамі, межы і склад якіх далёка не відавочныя і патрабуюць спец. даследавання ў кожным асобным выпадку. Аналагічнага тыпу задачы ўзніклі і ў сац. практыцы, калі замест лакальных, галіновых задач і прынцыпаў вядучую ролю пачалі адыгрываць буйныя комплексныя праблемы, якія патрабуюць цеснага ўзаемаўвязвання эканам., сац., экалагічных і інш. аспектаў грамадскага жыцця. Развіццё даследаванняў у гэтым кірунку выявіла недастатковасць агульнай тэорыі сістэм, якая ўжывалася раней. Для абазначэння больш шырокай сферы метадалагічных праблем з 1970-х г. пачалі ўжываць тэрмін «С.п.» Паняцці і прынцыпы С.п. выяўляюць больш шырокую пазнавальную рэальнасць у параўнанні з той, што фіксавалася ранейшымі ведамі, даюць новую схему тлумачэння, у аснове якой пошук канкрэтных механізмаў цэласнасці аб'екта, выяўленне поўнай тыпалогіі яго сувязей. З важнага для С.п. тэзіса аб разнастайнасці тыпаў сувязей вынікае, што складаны аб'ект дапускае не адно, а некалькі расчляненняў, з якіх неабходна выбраць «адзінку» аналізу, якая дасць магчымасць фіксаваць цэласныя ўласцівасці аб'екта, яго структуру і дынаміку. Па пазнавальных установах С.п. мае шмат агульнага з *структуралізмам* і *структурна-функцыянальным аналізам*.

Літ.: Блауберг И.В., Юдин Э.Г. Становление и сущность системного подхода. М., 1973; Уемов А.И. Системный подход и общая теория систем. М., 1978; Каган М.С. Системный подход и гуманитарное знание. Л., 1991; Абдеев Р.Ф. Философия информационной цивилизации. М., 1994. *М.В.Тараткевіч.*

СІСТЭ́МЫ СВЕ́ТУ, сукупнасць уяўленняў пра будову сістэм нябесных (касмічных) цел (Зямлі, Месяца, Сонца і планет), што існавалі на розных этапах развіцця цывілізацыі. Спробы стварыць мадэлі С.с. рабілі стараж. індусы, вавілаляне, грэкі і інш., аднак гістарычна найб. важнымі з'яўляюцца *геацэнтрычная сістэма свету* і *геліяцэнтрычная сістэма свету*. Уяўленні пра будову планетных сістэм з'яўляюцца асн. часткай астранамічнай карціны свету.

Літ.: Еремеева А.И. Астрономическая картина мира и ее творцы. Мн., 1984.

СІ-СЯ, Заходняе Ся, дзяржава, якая існавала ў канцы 10 — пач. 13 ст. на тэр. сучасных кіт. правінцый Ганьсу, Шэньсі і Нінся-Хуэйскага аўт. р-на. Створана народам мінья (тангуты), які ў 7—8 ст. прыйшоў з Тыбета і пасяліўся на плато Ордас як васал кіт. імперыі *Тан*. У 982 тангуцкі князь (ван) Цзіцянь пачаў паўстанне супраць імперыі *Сун*, якая ў 1006 фактычна прызнала незалежнасць С.-С. У 1038 правіцель Юань-хао [1032—48] прыняў тытул імператара (хуандзі), што паклала пачатак войнам з сунскім Кітаем, якія працягваліся аж да пач. 12 ст., калі Паўн. Кітай быў захоплены *чжурчжэнамі*. Перыяд ад-

носна мірнага развіцця С.-С. ў 12 ст. — час найб. росквіту яго культуры. Шырокі ўжытак набыло своеасаблівае тангуцкае пісьмо, створанае ў сярэдзіне 11 ст. З пач. 13 ст. дзяржава вяла барацьбу з манголамі, знішчана імі ў 1227. Тангуцкае насельніцтва асімілявана кітайцамі, ісламізаваныя тангуты сталі асновай сучаснага кіт.-моўнага мусульм. насельніцтва Паўн.-Зах. Кітая.

СІ́ТА (стараж.-інд. — баразна), у старажытнаіндыйскай ведычнай міфалогіі багіня раллі, у *вішнуізме* — аватара (увасабленне) жонкі бога Вішну *Лакшмі*, у эпасе *«Рамаяна»* — жонка героя *Рамы*. Паводле «Рамаяны», С. выкрадзена царом злых дэманаў (*ракшасаў*) Раванам. Пасля многіх подзвігаў Рама перамог Равану і вызваліў С., аднак неўзабаве прагнаў яе ў лес, бо яго падданыя падазравалі С. ў шлюбнай нявернасці. Пустэльнік Вальмікі (легендарны аўтар «Рамаяны») даў прытулак С. і выхаваў двух яе сыноў, а пасля, разам з імі, вярнуў яе Раме. Аднак пры сустрэчы з мужам С., па яе просьбе, паглынула яе маці — Зямля.

СІ́ТА, возера ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., на мяжы з Латвіяй, у бас. р. Друйка, за 16 км на З ад г. Браслаў. Пл. 1,88 км^2, даўж. 3,8 км, найб. шыр. 790 м, найб. глыб. 28,5 м, даўж. берагавой лініі 9,8 км. Пл. вадазбору 9,45 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу, складзена з 3 плёсаў. Схілы выш. 10—12 м (на Пд і З 5—6 м), параслі лесам і хмызняком, часткова пад лугам. Пойма шыр. 4—12 м. На ПнЗ, ПнУ і У стараж. берагавы вал выш. да 0,6 м. Берагі моцна парэзаныя, нізкія, пад хмызняком, на Пд забалочаныя. Востраў пл. 2,3 га. Дно да глыб. 7—9 м выслана пяском і апясчанымі адкладамі, глыбей ілам і сапрапелем. Вада з паніжанай мінералізацыяй (160—180 мг/л), высокай празрыстасці (5,2 м). Мезатрофнае з прыкметамі алігатрафіі. Шыр. паласы надводнай расліннасці 6—10 м (у паўн. і паўд. залівах да 50 м), падводная расце да глыб. 6—6,5 м. У возеры жыве рэлікт ледавіковага перыяду — лімнакалянус. Упадаюць некалькі ручаёў, на Пд выцякае ручай у воз. без назвы.

СІТАВА́ТАЯ ГУ́МА, порыстая гума, эластычны порысты матэрыял, выраблены на аснове латэксу ці цвёрдага каўчуку. С.г. з латэкснай сумесі наз. пенагумай, з сумесей на аснове цвёрдага каўчуку — губчатай ці ячэістай гумай.

Пенагума мае поры памерам 0,01—1 мм, уяўная шчыльн. 40—250 кг/м^3, адноснае падаўжэнне 90—350%. Газа- і водапранікальная (90—95% пор злучаны паміж сабой). Атрымліваюць мех. успеньваннем сумесей на аснове *латэксу натуралынага* ці (і) *латэксаў сінтэтычных* з наступнай вулканізацыяй пены ў формах пры 100—140 °С; вырабляюць у выглядзе блокаў ці пласцін. Губчатая гума мае поры ад ~ 0,4 мкм (мікрапорыстая гума) да 0,2—0,4 мм, злучаныя або замкнутыя; для С.г. на аснове натуральнага каўчуку ўяўная шчыльн. 500—700 кг/м^3, адноснае падаўжэнне 200—300%. Яе вырабляюць у выглядзе лістоў, пласцін і вырабаў з гумавых сумесей (гл. *Гума*), якія маюць *пораўтваральнікі*, што ўспеньваюць сумесь пры вулканізацыі. Выкарыстоўваюць С.г. для вырабу амартызатараў, цепла- і гукаізаляцыйных пракладак, плывучых і выратавальных сродкаў, мэблі, сядзенняў трансп. сродкаў і інш.

СІТА́ЛЫ, неарганічныя матэрыялы, якія ўтвараюцца пры аб'ёмнай крышталізацыі *шкла*. Матэрыялы, падобныя на С., наз. таксама піракерамам, дэвітракерамам, шклокерамам. Першыя С. атрыманы ў 1950-я г.

У С. мікракрышталі (< 1 мкм) адной або некалькіх крышт. фаз размеркаваны ў шклопадобнай фазе; колькасць крышт. фазы ад 20 да 95% па аб'ёме. Большасць С. маюць высокую мех. трываласць і цвёрдасць, зноса- і тэрмаўстойлівыя, газа- і вільгаценепранікальныя, хімічна ўстойлівыя. Атрымліваюць С. і вырабы з іх пераважна па шкляной (найб. пашырана) і керамічнай тэхналогіях. Шкляная тэхналогія ўключае: варку шкла з шыхты, у якую дадаюць спец. ініцыятары (пераважна аксіды тытану, хрому, нікелю, жалеза), што выклікаюць раўнамерную крышталізацыю ва ўсім аб'ёме; фармаванне вырабаў і іх тэрмічную апрацоўку паводле рэжыму, які забяспечвае атрыманне С. неабходнага фазавага саставу. Выкарыстоўваюць у розных галінах прам-сці і тэхніцы, напр., высокатрывалыя (С. на аснове сістэмы MgO — AL_2O_3 — SiO_2) у ракета- і авіябудаванні, радыёэлектроніцы, аптычна празрыстыя (Li_2O — Al_2O_3 — SiO_2) у касм. і лазернай тэхніцы, у медыцыне (біясіталы), буд-ве (шлака- і петрасіталы).

Літ.: Жунина Л.А., Кузьменков М.И., Яглов В.Н. Пироксеновые ситаллы. Мн., 1974; Бобкова Н.М., Силич Л.М. Бесщелочные ситаллы и стеклокристаллические материалы. Мн., 1992.

СІТА́НСКІЯ, сям'я бел. музыкантаў, спевакоў, танцораў 2-й пал. 18 ст. Леан С. (каля 1745, г. Гродна — 1800), скрыпач, дырыжор, педагог; адзін з найб. выдатных музыкантаў свайго часу. З 1765 першы скрыпач і капельмайстар *Гродзенскай капэлы Тызенгаўза*, кіраўнік *Гродзенскай музычна-тэатральнай школы Тызенгаўза*. У 1781 выступаў з канцэртамі ў Італіі. Пад яго кіраўніцтвам Гродзенская капэла стала адной з лепшых у Еўропе. Барталамей С. (? — пасля 1785), клавікардыст, педагог. Брат Леана. У 1776?—81? музыкант Гродзенскай капэлы Тызенгаўза. Выкладаў у Гродзенскай муз.-тэатр. школе Тызенгаўза ігру на клавікордзе, фагоце і скрыпцы, пазней у Паставах. Сымон С. (Шымон; ? — люты 1785), музыкант, брат Леана і Барталамея. З 1771 працаваў у Гродзенскай капэле Тызенгаўза; выкладаў у Гродзенскай муз.-тэатр. школе Тызенгаўза ігру на габоі і скрыпцы. З 1781 у Нясвіжскай капэле Радзівілаў. Дарота С. (каля 1767 — ?), танцоўшчыца (працавала да 1797). Жонка Леана. Прыгонная Тызенгаўза і выхаванка яго балетнай школы ў Паставах (педагог Ф.Г.Ле Ду). Выступала ў пастаноўках пераважна з Малгажатай С. (да 1787 пад дзявочым прозвішчам Пякарская). У 1785—95 салістка каралеўскай трупы «танцораў нарадовых» у Польшчы. З 1795 у Гродне, у 1795—97 выступала ў Львове. Малгажата С. (Магдалена, Вікторыя), спявачка. Дачка Леана. У 1777—80 вучылася спевам, ігры на клавесіне (педагог К.Абатэ) і танцам (педагог Ле Ду) у Гродзенскай муз.-тэатр. школе Тызенгаўза, пазней, да 1783, у Паставах. З 1785 удасканальвала майстэрства ў Пецярбургу. У 1786—91 выступала ў «Тэатры нарадовым» у Варшаве. Пазней артыстка каралеўскага т-ра ў Лазенках (каля Варшавы). Вылучалася асаблівымі здольнасцямі. Выступала пераважна ў камічных операх.

Літ.: Żo'rawska-Witkowska A. Kapela Antoniego Tyzenhauza w Grodnie // Muzyka. 1977. № 2. *А.Л.Капілаў.*

СІТАПАДО́БНЫЯ ТРУ́БКІ, праводныя элементы *лубу*.(флаэмы) голанасенных і кветкавых раслін. Утвараюцца з *пракамбію* і *камбію*. У кветкавых раслін С.т. — аднарадныя цяжы злучаных канцамі цыліндрычных жывых бяз'ядзерных клетак. Іх характэрная асаблівасць — папярочныя перагародкі паміж клеткамі-членікамі, якія маюць шматлікія навылётныя адтуліны (перфарацыі), што нагадваюць сіта (адсюль назва). Праз іх па ўсёй сістэме С.т. злучаецца пратаплазма клетак і праходзяць растворы, багатыя арган. рэчывамі. Да С.т. прымыкаюць функцыянальна і генетычна звязаныя з імі жывыя суправаджальныя клеткі. У голанасенных раслін перфарацыі рассеяны на бакавых сценках моцна выцягнутых і звостраных на канцах клетак-членікаў, якія пазбаўлены суправаджальных клетак і маюць ядры. У большасці раслін С.т. функцыянуюць 1 год, у вінаграду — 2, ліпы — некалькі, некат. пальм — дзесяткі гадоў. *В.М.Прохараў.*

СІ́ТАЎКІ, пліскі (Motacilla), род птушак сям. сітаўкавых атр. вераб'інападобных. 11 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Афрыцы. Жывуць на адкрытых прасторах у тундрах, стэпах, на балотах, лугах, некат. ў лясах і зараснікаў. На Беларусі 3 віды С.: белая (M. alba), жоўтагаловая (M. citreola), жоўтая (M. flava).

Даўж. цела да 23 см, маса да 30 г. Апярэнне чорнае, белае, шэрае, жоўтае і зеленаватае. Ногі тонкія і доўгія, добра прыстасаваныя для перамяшчэння па зямлі. Хвост доўгі, ім С. пастаянна патрэсваюць (адсюль рус. назва трясогузки). Насякомаедныя. У кладцы 2—7 яец.

СІТКЕ́ВІЧ Міхаіл Васілевіч (н. 25.10.1949, г. Баранавічы Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне матэрыялазнаўства. Д-р тэхн. н. (1990), праф. (1993). Скончыў БПІ (1971). З 1978 у БПА. Навук. працы па праблемах і даследаванні дыфузійнага ўмацоўвання металарэзнага інструменту, тэхнал. аснасткі, дэталей машын у спецыялізаваных дыфузійна-актыўных парашковых асяроддзях.

Тв.: Химико-термическая обработка инструментальных материалов. Мн., 1986 (у сааўт.); Совмещенные процессы химико-термической обработки с использованием обмазок. Мн., 1987 (разам з Я.І.Бельскім).

СІ́ТНА, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Сасніца, за 44 км на ПнУ ад г. Полацк. Пл. 1,83 км², даўж. 2,8 км, найб. шыр. 970 м, найб. глыб. 7,5 м, даўж. берагавой лініі 7,2 км. Пл. вадазбору 8,5 км². Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы выш. 8—9 м, параслі лесам і хмызняком, на Пд выш. да 17 м, у верхняй ч. разараныя. Пойма шыр. 10—40 м, укрытая хмызняком, на ПнЗ пераходзіць у вярховае балота. Берагі нізкія, пясчаныя, на Пн тарфяныя. У крайніх паўд.-зах. і паўн.-ўсх. частках катлавіны мелі з глыб. 1,2, 1,7 і 2,3 м. Дно да глыб. 4 м выслана пяском і апясчаненым ілам, глыбей — сапрапелем. Мінералізацыя вады 120—150 мг/л. празрыстасць 1,9 м. Эўтрофнае. Моцна зарастае. Шыр. паласы расліннасці да 200 м, пашырана да глыб. 3,2 м. На Пд выцякае ручай у воз. Сіценец.

СІ́ТНАЎСКІ ЗА́МАК. Існаваў у 16 ст. на паўд.-зах. беразе воз. Сітна каля вытокаў р. Палата (Полацкі р-н Віцебскай вобл.). Пабудаваны ў 1563 з дрэва на штучнай земляной выспе, умацаванай драўлянымі канструкцыямі. Трапецападобную форму замка вызначала канфігурацыя мыса, утворанага берагам возера і лукавінай ракі. Быў умацаваны драўлянымі абарончымі сценамі-гароднямі з 4 вуглавымі чацверыковымі 3-яруснымі вежамі (на паўкруглых у плане асновах), накрытых двухсхільнымі дахамі. Праезд у замак размяшчаўся ў сцяне з боку перашыйка паміж ракой і возерам. 1-павярховая драўляная забудова размяшчалася ў цэнтры замка, свабодная прастора ўздоўж сцен прызначалася для манеўра войск. С.з. разбураны войскамі ВКЛ у 1566, потым адбудаваны і зноў знішчаны пры штурме ў час Лівонскай вайны 1558—83. Вядомы паводле малюнка С.Пахалавіцкага 1579. *Ю.А.Якімовіч.*

СІ́ТНЕНСКАЕ ВО́ЗЕРА, Сітняцкае возера. У Лёзненскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Вярхіта, за 24 км на ПдЗ ад г.п. Лёзна. Пл. 0,47 км², даўж. 1,88 км, найб. шыр. 300 м, даўж. берагавой лініі 4,25 км. Пл. вадазбору 9,77 км². Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы выш. 10—14 м, параслі хмызняком, на Пн — лесам. Берагі пераважна зліваюцца са схіламі. На З выцякае ручай у р. Вярхіта.



Сітнаўскі замак. З малюнка С.Пахалавіцкага. 1579.

СІ́ТНЁГ, род кветкавых раслін, тое, што *балотніца*.

СІ́ТНІК (Juncus), род кветкавых раслін сям. сітнікавых. Больш за 250 відаў. Пашыраны ва ўмерана цёплых і халодных абласцях, некат. — у высакагор'ях тропікаў і субтропікаў. На Беларусі 19 відаў. Найб. вядомыя С.: ніткападобны (J. filiformis), разгалісты (J. effusus), рапухавы (J. bufonius), скучаны (J. conglomeratus), сплюшчаны (J. compressus), членісты (J. articulatus). Трапляюцца на балотах, па берагах вадаёмаў.

Адна- і шматгадовыя травяністыя расліны выш. ад 2—3 да 80—90 см. Сцёблы шматлікія, цыліндрычныя. Ніжняе лісце лускападобнае, сцябловае — з цыліндрычнай голай пласцінкай, часам усё лісце лускападобнае. Кветкі бураватыя ці зеленаватыя, адзінкавыя або сабраныя ў пучкі. Плод — каробачка. Сцёблы некат. відаў выкарыстоўваюць для пляцення вырабаў. *А.М.Скуратовіч.*

СІ́ТНІКІ, вёска ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл., на р. Свіслач. Цэнтр Ананіцкага с/с і калгаса. За 15 км на Пн ад г. Мар'іна Горка, 55 км ад Мінска, 15 км ад чыг. ст. Пухавічы. 402 ж., 127 двароў (2001). Міжгасп. аб'яднанне «Ананічы», прадпрыемствы па памоле мукі і разліве спіртных напіткаў. Сярэдняя школа-сад, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

Сітнік: 1 — членісты; 2 — рапухавы; 3 — разгалісты.

СІ́ТНІЦА Віктар Васілевіч (1927, в. Курыцічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. — май 1944), удзельнік партыз. руху ў Палескай вобл. ў Вял. Айч. вайну. З ліп. 1942 у партызанах: разведчык атрада А.Р.Волкава, са жн. 1943 падрыўнік 125-й Капаткевіцкай партыз. брыгады. Пусціў пад адхон 9 варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай. У маі 1944 схоплены акупантамі і закатаваны. Узнаг. ордэнам Айч. вайны.

СІ́ТНІЦА Рыгор Сямёнавіч (н. 1.1.1958, в. Курыцічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. графік. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1982). З 1983 выкладае ў Бел. каледжы мастацтваў. Творчасці ўласцівы спалучэнне супрэ-

Сітаўкі: 1 — жоўтая; 2 — жоўтагаловая; 3 — белая.

матычных і канструктывісцкіх прынцыпаў у пабудове кампазіцыі, гіперрэаліст. трактоўка формы, сімвалічнасць маст. мовы. Аўтар графічных лістоў: «Кветкі для Іны» (1981), «Кліч матчынай песні» (1986), «Мастак Язэп Драздовіч» (1987), «Рубон!» (1993), «Няміга» (1994), «Каложа» (1995); серый «Вянок пашаны паэту» (1988), «Нясвіжскае рэха» (1991—92), «Верхні горад» (1994), «Новы дом» (1995), «Святло адвечнае», «Краіна забыцця» (абедзве 1996), «Замак» (1997), «Ратаванне Грэцыяй» (1998), «Гаспода» (1999—2001). Іл. гл. таксама да арт. *Графіка*.

СІ́ТНІЦКАЕ, радовішча будаўнічага каменю ў Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл., каля в. Сітніца. Прымеркавана да выступу дапалеазойскага крышт. фундамента, прадстаўлена пераважна гранітамі і дыярытамі. Пароды ружаватых і шэрых адценняў, сярэднезярністыя, зверху закранутыя выветрываннем, участкамі да першаснага кааліну, які залягае ў зах. ч. радовішча і належыць да ўскрышных парод. Разведаныя запасы буд. каменю (да глыб. 150 м) 263,1 млн. м^3, перспектыўныя 277,2 млн. м^3. Запасы кааліну 2 млн. т. Магутнасць ускрышных парод (пяскі, алеўрыты) 9—64 м. Граніты і дыярыты прыдатныя на выраб друзу.

А.П.Шчураў.

СІ́ТНІЦКАЯ ЖАЛЕЗААПРАЦО́ЎЧАЯ МАНУФАКТУ́РА. Дзейнічала ў 1797 у в. Сітніца Мазырскага пав. (цяпер у Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл.). Працавала больш за 50 чал., вырабляла 500 пар метал. сашнікоў для сох.

СІТНЯ́ЦКАЕ ВО́ЗЕРА, адна з назваў *Сітненскага возера*.

«СІТРАЭ́Н» (Citroen), сям'я аўтамабіляў аднайм. франц. фірмы (з 1976 «Пежо-Сітраэн»; гл. «*Пежо*»). Выпускаецца з бензінавымі або дызельнымі рухавікамі з 1919. Пярэднепрывадныя легкавыя аўтамабілі розных класаў маюць рухавік магутнасцю ад 33 да 147 кВт, 2-ці 4-месны (у мікрааўтобусаў — да 8) кузаў хэтчбэк ці універсал, найб. скорасць да 222 км/гадз. Грузавыя аўтамабілі асабліва малой і малой (ад 0,5 да 2 т) грузападымальнасці маюць рухавік магутнасцю да 76 кВт.

СІТУ́АЦЫЯ (ад позналац. situatio становішча), 1) сукупнасць абставін, якія ствараюць пэўнае становішча, што патрабуе таго ці інш. рэагавання; таксама становішча, у якім хто-н. знаходзіцца. 2) У картаграфіі С. наз. сукупнасць адлюстраваных на карце ці плане пры дапамозе ўмоўных знакаў водных прастораў, лясоў, гор, населеных пунктаў, дарожнай сеткі і інш. асаблівасцей мясцовасці.

СІ́ТЦЫ, вёска ў Докшыцкім р-не Віцебскай вобл., на аўтадарозе Докшыцы — Мядзел. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 19 км на З ад г. Докшыцы, 220 км ад Віцебска, 7 км ад чыг. ст. Параф'янава. 782 ж., 323 двары (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнікі архітэктуры: Свята-Георгіеўская царква (1913), брама (пач. 18 ст.).

Р.Сітніца. Няміга. 1994.

СІТЭРМА́Н Лазар Якаўлевіч (кастр. 1894, г. Мазыр Гомельскай вобл. — кастр. 1941), бел. вучоны ў галіне медыцыны. Д-р мед. н., праф. (1933). Засл. дз. нав. Беларусі (1939). Скончыў Юр'еўскі ун-т (1916). З 1916 ваен. ўрач, з 1921 гал. ўрач цэнтр. паліклінікі Мінска, у 1923—30 асістэнт тэрапеўт. клінікі мед. ф-та БДУ, з 1931 заг. кафедры Мінскага мед. ін-та. Навук. працы па пытаннях этыялогіі, клінікі і лячэння сардэчна-сасудзістых хвароб.

Тв.: Расстройства ритма сердца: Этиогенез, клиника и терапия. Мн., 1935; Инфаркт миокарда. Мн., 1938; Сборник клинических рецептов пропедевтической терапевтической клиники Минского мед. ин-та. Мн., 1939.

СІЎКО́ Франц (Франц Іванавіч; н. 3.5.1953, в. Вята Міёрскага р-на Віцебскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1975). Настаўнічаў. З 1986 у бюро прапаганды маст. л-ры Саюза пісьменнікаў Беларусі, з 1991 у газ. «Віцебскі рабочы», з 1993 у Віцебскім тэхнал. ун-це, з 1999 сакратар Віцебскага абл. аддзялення Саюза бел. пісьменнікаў. Друкуецца з 1987. У зб-ках прозы «З чым прыйдзеш» (1991), «Апошняе падарожжа ў краіну ліваў» (1997), «Удог» (2001) раскрывае маральна-этычныя і сац. праблемы сучаснасці, даследуе бел. грамадства на пераломных гіст. этапах. Аўтар навукова-папулярнага даследавання «Гістарычныя ўмовы развіцця беларускай мовы» (1997), казак і апавяданняў для дзяцей, публіцыстычных і навукова-папулярных артыкулаў і інш.

Літ.: Марціновіч А. Кавальчук у ролі... Шэрлака Холмса // Полымя. 1998. № 4.

Грузапасажырскі аўтамабіль **«Сітраэн»**: серыя ZX мадэль Брэк.

СІЎЦО́Ў Іван Кузьміч (27.12.1922, в. Бакунавічы Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 9.11.1959), бел. пісьменнік. Скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1948). Працаваў заг. сектара друку Магілёўскага абкома КП(б)Б (1948—50), у час. «Бярозка» (1950—52) і «Беларусь» (з 1952). Аўтар артыкулаў, нарысаў, апавяданняў, аповесці для дзяцей «Самыя юныя» (1949), прысвечанай тэме партыз. барацьбы супраць ням.-фаш. захопнікаў на Беларусі, і рамана «Нягоды і радасці» (1960) пра пасляваен. будаўніцтва.

СІЎЧЫКАЎ Уладзімір Мікалаевіч (н. 3.5.1958, г. Жодзіна Смалявіцкага р-на Мінскай вобл.), бел. пісьменнік, перакладчык. Скончыў Мінскае маст. вучылішча (1977), БДУ (1986). Настаўнічаў, працаваў мастаком-афарміцелем. У 1986—90 у час. «Бярозка». З 1994 дырэктар выд-ва «Радыёла-плюс». Друкуецца з 1982. Аўтар кн. апавяданняў і п'ес «Гульня ў тэстамент» (1992), зб. прозы «Лісты да брата» (1998), у якіх філас. роздум над праблемамі сучаснасці. Пераклаў з груз. на бел. мову раман Н.Думбадзе «Закон вечнасці» (1989), некат. вершы груз. паэтаў. На груз. мову пераклаў зб. версэтаў А.Разанава «Горад-вандроўнік» (1991). Аўтар п'есказак. У яго пераказе ў Віцебскім т-ры «Лялька» паст. (1995) п'еса-казка паводле О.Уайльда «Хлопчык-зорка». У 1987—89 па сваіх сцэнарыях вёў тэлеперадачы «У сям'і адзінай», «Дыялогі маладых перакладчыкаў». *І.У.Саламевіч.*

СІФАНАФО́РЫ (Siphonophora, ад грэч. siphōn трубка + phoros які нясе), падклас беспазваночных жывёл кл. гідроідных тыпу кішачнаполасцевых. Каля 170 відаў (па інш. звестках 250). Пашыраны ў акіянах і морах з высокай салёнасцю вады, пераважна ў трапічных і цёплых водах да глыб. 5000 м. Найб. вядомыя «партугальскі караблік» (Physalia), фізафора (Physophora hydrostatica).

Даўж. цела 1 см — 3 м (разам са шчупальцамі да 20 м). Празрыстыя арганізмы, асобныя ч. цела яркія. Каланіяльныя, калоніі паліморфныя (гл. *Полімарфізм*), складаюцца з асобін, якія выконваюць пэўныя функцыі: перамяшчэння (маюць пнеўматафор і «плавальны каўпак», або нектафор), кармлення (гастразоіды з доўгім рухомым прыдаткам, або «арканчыкам» з *жыгучымі клеткамі*), размнажэння (ганазоіды). Звычайна розныя асобіны калоніі сабраныя ў групы — кармідыі. Размнажэнне палавое. Лічынка (відазмененая планула) шляхам пачкавання ўтварае маладую калонію. Кормяцца дробнымі марскімі жывё-

ламі. Некат. буйныя трапічныя С. небяспечныя для чалавека (выклікаюць цяжкія апёкі і агульнае захворванне з павышэннем т-ры).

Да арт. **Сіфанафоры**. «Партугальскі караблік».

СІФІЛІС, л ю э с, хранічная *венерычная хвароба*, якая выклікаецца бледнай *трэпанемай*. Пашкоджвае ўсе органы і тканкі арганізма чалавека, мае шматгадовы хвалепадобны характар цячэння з перыядамі затухання і абвастрэння. Перадаецца пераважна палавым шляхам, бывае бытавы С. і ўнутрывантробны (прыроджаны, які можа развівацца ў любым узросце). Крыніца інфекцыі — хворы на С.

Адрозніваюць інкубацыйны, першасны, другасны і трацічны перыяды хваробы. У першасны перыяд на месцы пранікнення ўзбуджальніка развіваецца першасная язва (цвёрды шанкер), павялічваюцца бліжэйшыя лімфатычныя вузлы. Другасны перыяд найб. кантагіёзны, на скуры і слізістых абалонках хворага пашыраецца разнастайная высыпка (плямістая, вузельчыкавая, гнайнічковая), бывае пляшывасць. Трацічны ўзнікае, калі С. не лечаць. Утвараюцца гумы (спецыфічныя бугаркі і вузлы) у скуры, касцях, унутр. органах, нерв. сістэме. Лячэнне тэрапеўтычнае. Гл. таксама *Венерычныя хваробы*. *М.З.Ягоўдзік.*



Сіфон.

СІФО́Н (ад грэч. siphōn трубка, помпа), 1) выгнутая трубка з каленамі рознай даўжыні, па якой пераліваецца вадкасць з пасудзіны з больш высокім узроўнем у пасудзіну з больш нізкім узроўнем. Верхняя частка трубкі размешчана вышэй за ўзровень вадкасці ў верхняй пасудзіне. Трубку папярэдне запаўняюць вадкасцю. Выкарыстоўваецца ў гідраўлічных збудаваннях і прыстасаваннях. 2) Пасудзіна з трубкай, якая дасягае дна і мае кран. Выкарыстоўваецца для пераліванне пеністых вадкасцей пад ціскам.

СІФО́НАВЫЯ ВО́ДАРАСЦІ (Siphonophyceae, Bryopsidophyceae), клас зялёных водарасцей. Каля 30 родаў, 300 відаў. Пашыраны пераважна ў трапічных морах ад берагавой зоны да глыб. 70 м (некат. трапляюцца ў морах умераных паясоў, напр., *каўлерпа*). У выкапнёвым стане вядомыя з ардовікскага перыяду.

Слаявіны буйныя (выш. да 0,5 м), няклетачнай будовы (без папярочных перагародак) са шматлікімі ядрамі і дыскападобнымі хларапластамі. Маюць пігменты. Размнажэнне вегетатыўнае, бясполае і палавое. Ужываюцца ў ежу. *Т.М.Міхеева.*

СІХАТЭ-АЛІ́НСКІ ЗАПАВЕ́ДНІК б і я с ф е р н ы. У Прыморскім краі (Расія) на ўсх. і зах. схілах хр. Сіхатэ-Алінь (выш. да 1600 м) і ўзбярэжжы Японскага мора. Засн. ў 1935. Пл. 347,1 тыс. га. Шмат рэк, крыніц, горных азёр. Асн. тып глеб — бурыя горна-лясныя. Лясы займаюць 99% тэр., добра вызначана паясная занальнасць. Пануюць кедроўнікі, якія ўтвараюць шматлікія асацыяцыі. У флоры больш за 1000 відаў вышэйшых раслін, у т.л. рэдкіх і знікаючых. Млекакормячых 62 віды, сярод якіх прадстаўнікі прыамурскай, маньчжурскай, японскай фауны: амурскі тыгр, чорны мядзведзь, гарал, плямісты алень, магера, янотападобны сабака; з барэальнай фауны — буры мядзведзь, лось, собаль. Больш за 320 відаў птушак, у т.л. эндэмікаў. Разводзяць гаралаў.

СІХАТЭ-АЛІ́НСКІ МЕТЭАРЫ́Т, жалезны метэарыт, які ўпаў 12.2.1947 у заходніх адгор'ях Сіхатэ-Алінскага хрыбта.

Выпаў у выглядзе метэарытнага дажджу, які ўтварыўся ад драбнення асн. масы на выш. 4—5 км над Зямлёй. Падзенне суправаджалася ўспышкамі святла і выбухамі. Найбольшыя яго экзэмпляры ўтварылі кратэры дыяметрам ад 4 м да 28 м, дробныя рассеяліся на плошчы каля 3 км^2. Агульная маса метэарытнага рэчыва прыкладна 70 т, маса асколкаў і асобных экзэмпляраў, знойдзеных на плошчы падзення, 37 т, найбольшы з іх 1745 кг. Складаўся з жалеза (93%), нікелю (6%) і невял. колькасці фосфару, кобальту, серы і медзі.

Літ.: К р и н о в Е.Л. Железный дождь. М., 1981.

СІХАТЭ-АЛІ́НЬ, горная сістэма на ПдУ Расіі ў Прыморскім і Хабараўскім краях, паміж Японскім м. і далінамі р. Усуры і ніжняга Амура. Даўж. 1200 км, шыр. да 250 км, сярэдняя выш. 800—1000 м, найвыш. пункт г. Тардокі-Яні (2077 м). Складаецца з хрыбтоў, выцягнутых з ПнУ на ПдЗ і падзеленых глыбокімі далінамі. Пераважае сярэднеўзгорысты рэльеф. Паўн. ч. — высокае плато, складзенае гал. ч. з базальтаў. На У абрываецца да мора, утвараючы сярэднягорныя хрыбты са стромкімі схіламі. Асобныя невял. базальтавыя плато характэрны і для паўд. ч. гор. Цэнтр. ч. складаецца з найб. высокіх горных хрыбтоў паўн.-ўсх. распасцірання. На З паката паніжаецца да даліны р. Усуры; характэрны вузкія падоўжаныя даліны і катлавіны, якія аддзяляюць перадавыя хрыбты (выш. 900—1300 м): Сіні, Усх. Сіні, Халодны і інш. Вышэй за 900—1700 м — гальцы. Рэшткі стараж. зледзянення. Восевая ч. складаецца з ніжнепалеазойскіх метамарфічных сланцаў і кварцытаў, перарваных інтрузіямі гранітаў, усх. і зах. — з мезазойскіх адкладаў (пясчанікі, кангламераты, алеўрыты). Пашыраны (асабліва на Пн) андэзіта-базальтавыя пароды палеагенавага ўзросту. Сейсмічны, землетрасенні да 6—7 балаў. З інтрузіямі звязана арудзяненне (волава, золата, поліметалы, вальфрамавыя руды). У тэктанічных упадзінах паклады бурага і каменнага вуглёў. Клімат мусонны. Сярэдняя т-ра студз. ад -12 да -26 °С; ліп. 15—21 °С. Ападкаў 600—1000 мм за год. З зах. схілу вытокі р. Усуры і яе прытокаў Вял. Усурка, Бікін, Хор, прытокаў Амура — Анюй, Гур; з усх. — малыя горныя рэкі, што ўпадаюць у Татарскі праліў. Схілы гор укрыты лясамі, на Пн хвойнымі (аянская елка, белакорая піхта, даурская лістоўніца), на Пд і ў цэнтр. ч. (да выш. 500 м) — хвойна-шыракалістымі (мангольскі дуб, ліпа, клён, маньчжурскі арэх, карэйскі кедр). На найб. высокіх вяршынях — горная тундра. *Сіхатэ-Алінскі запаведнік* і Лазоўскі запаведнік.

СІХРА Андрэй Восіпавіч (1773, г. Вільня — 15.12.1850), гітарыст, кампазітар. Па паходжанні чэх. З 1801 працаваў у Маскве, з 1813 у Пецярбургу. З 1926 выдаваў нотны «Journal pour la guitare...» («Часопіс для гітары»), у 1828—29 «Петербургский журнал для гитары...» Удасканаліў 7-струнную гітару, зацвердзіў яе сучасны строй. Гітарыст-віртуоз, выступаў у шматлікіх гарадах. Аўтар твораў для гітары, у т.л. варыяцыі на рус. нар. песні, перапрацаваныя твораў розных кампазітараў. Складальнік кн. «Тэарэтычная і практычная школы для 7-струннай гітары» (1870).

СІЦЗЯ́Н, Ч ж у ц з я н, Ж а м ч у ж н а я, рака на ПдУ Кітая. Даўж. 2130 км, пл. бас. 437 тыс. км^2. Вытокі на Юньнаньскім нагор'і. Назва С. пасля сутокаў рэк Юцзян і Цзацзян вышэй г. Наньнін. Цячэ ў вузкай, глыбокай даліне ўздоўж паўд. ускраіны гор Наньлін, упадае ў Паўд.-Кітайскае м., утварае дэльту (пл. 16,9 тыс. км^2), дзе зліваюцца воды рэк С., Бэйцзян і Дунцзян. Сярэдні расход вады каля 8 тыс. м^3/с, макс. — 58 тыс. м^3/с) (у час летніх мусонных дажджавых паводак). Ваганні ўзроўню вады да 15—20 м. Частыя паводкі (у бас. С. пабудавана каля 2 тыс.

км ахоўных дамбаў). Выкарыстоўваецца для арашэння. Суднаходная ад г. Учжоў. У дэльце — марскі порт Гуанчжоў.

СІ́ЦІ (City), цэнтральная частка і гіст. цэнтр г. Лондан, у якой сканцэнтраваны канторы і праўленні найбуйнейшых банкаў і страхавых кампаній прамысл., гандл. і трансп. дзейнасці краіны. С. — сінонім англ. фін. алігархіі.

Сіхатэ-Алінскі запаведнік.

СІЦЫ́ЛІЙ АБЕ́ДЗВЮХ КАРАЛЁЎСТВА, дзяржава на тэр. в-ва Сіцылія і Паўд. Італіі ў 1504—1860 (з перапынкамі). Утворана пасля аб'яднання пад уладай Іспаніі *Неапалітанскага каралеўства* з Сіцыліяй. Пасля вайны заісп. спадчыну 1701—14 Сіцылія адышла да *Савойскага герцагства*, кантынентальная частка каралеўства — да Аўстрыйскай імперыі. У 1720 абедзве часткі зноў аб'яднаны пад уладай *Габсбургаў*. З 1735 у каралеўстве правіліісп. *Бурбоны*. У студз. 1799 тут абвешчана *Партэнапейская рэспубліка*, але ў чэрв. 1799 улада Бурбонаў адноўлена. У 1806 на кантынентальнай ч. ўтворана залежнае ад Францыі Неапалітанскае каралеўства (1806—15). Паводле рашэнняў *Венскага кангрэса 1814—15* С.а.К. адноўлена пад уладай Бурбонаў. Неапалітанская рэвалюцыя 1820—21 задушана аўстр. войскамі. У выніку *рэвалюцыі 1859—60 у Італіі*, якая скінула ўладу Бурбонаў, С.а.К. ліквідавана, яго тэр. далучана да *Сардзінскага каралеўства*.

СІЦЫЛІ́ЙСКАЕ КАРАЛЁЎСТВА, дзяржава ў 12—13 ст., якая ўключала тэр. в-ва Сіцылія і Паўд. Італіі, заваяваныя нарманамі ў канцы 11 ст. Афармілася з каранацыяй Ражэра II [1130—54], заснавальніка Нарманскай дынастыі. Яго пераемнікі Вільгельм I [1154—66] і Вільгельм II [1166—89], абапіраючыся на дробнае рыцарства і царкву, стварылі магутную дзяржаву. У 1194 сіцылійская карона перайшла да імператара Генрыха VI Штаўфена (гл. *Генрых*, ням. каралі). У час праўлення Фрыдрыха II [1197—1250] завяршылася цэнтралізацыя С.к. Паводле законаў 12—13 ст. буйныя феадалы і гарады пазбаўлены вольнасцей, сяляне прымацаваны да зямлі. У 1266—68 апошнія сіцылійскія Штаўфены разбіты Карлам I Анжуйскім [1268—82]. У выніку паўстання ў 1282 на в-ве Сіцылія (гл. «*Сіцылійская вячэрня*») С.к. распалася. Сіцылія трапіла пад уладуісп. Арагонскай дынастыі. У руках Анжуйскай дынастыі засталася толькі Паўд. Італія (*Неапалітанскае каралеўства*).

СІЦЫЛІ́ЙСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1943, баявыя дзеянні англа-амерыканскіх войск па авалоданні в-вам Сіцылія 10.7—17.8.1943 у 2-ю сусв. вайну. Мэта аперацыі (кодавая назва «Хаскі») — захапіць Сіцылію, каб стварыць плацдарм для наступлення на кантынент. Італію (гл. *Італьянская кампанія 1943—45*). С.а. ажыццяўляла 15-я англа-амер. група армій у складзе 8-й англ. і 7-й амер. армій (усяго 478 тыс. чал.) пры ўдзеле буйных сіл флоту і авіяцыі. Узначаліў С.а. вярх. галоўнакамандуючы сіламі на Міжземнаморскім тэатры ваен. дзеянняў ген. Д.*Эйзенхаўэр*. Абаранялі Сіцылію 6-я італьян. армія і 2 ням. дывізіі — усяго 255 тыс. чал. (яшчэ 2 ням. дывізіі былі перапраўлены на в-аў у першыя дні баёў). Высадцы дэсанта папярэднічалі двухмесячныя сістэматычныя налёты саюзнай авіяцыі на аэрадромы, парты, базы падводных лодак, прамысл. цэнтры, размешчаныя ў Сіцыліі, Сардзініі і на Пд Апенінскага п-ва. У ходзе 1-га этапу С.а. англа-амер. войскі 10 ліп. высадзіліся на ПдУ і ПдЗ вострава і да 14 ліп. захапілі плацдармы глыбінёй 5—15 км. Італьян. войскі аказвалі пасіўнае супраціўленне, ням. дывізіі процідзейнічалі наступаючым больш арганізавана. Да 18 ліп. саюзнікі авалодалі паўд. ч. в-ва. На 2-м этапе С.а. англа-амер. войскі занялі ўвесь востраў і 17 жн. ўвайшлі ў г. Месіна, які пакінулі ням. войскі і марскім шляхам пераправіліся на мацерыковую Італію. Большасць італьян. войск трапіла ў палон.

Літ.: Типпельскирх К. История второй мировой войны, 1939—1945: Пер. с нем. М., 2001. *Ю.В.Грыбоўскі.*

«СІЦЫЛІ́ЙСКАЯ ВЯЧЭ́РНЯ», паўстанне ў г. Палерма (в-аў *Сіцылія*) у 1282 супраць франц. прыхільнікаў караля Карла I Анжуйскага, які ў 1268 падпарадкаваў сваёй уладзе *Сіцылійскае каралеўства*. Карл рэзка павысіў у Сіцыліі падаткі, пазбавіў гарады прывілеяў, канчаткова заняволіў сялян, не лічыўся са стараж. звычаямі і вольнасцямі мясц. насельніцтва, перанёс сталіцу Сіцылійскага каралеўства з Палерма ў Неапаль. Паўстанне пачалося стыхійна 31 сак. (паводле пазнейшай легенды — пад сігнал звона да вячэрні; адсюль назва). Большасць французаў (3—4 тыс.) была забіта. Палермскім парламентам сіцылійская карона прапанавана арагонскаму каралю Педра III, які ў вер. 1382 прыбыў на востраў і авалодаў усёй Сіцыліяй. Вайна супраць французаў скончылася ў 1302 поўным адпадзеннем ад Паўд. Італіі Сіцыліі, дзе ўсталявалася Арагонская дынастыя.

СІЦЫЛІ́ЙСКІ ПРАЛІ́Ў, другая назва *Туніскага праліва*.

СІЦЫЛІ́ЙСКІЯ ПАЎСТА́ННІ РАБО́Ў, паўстанні рабоў на в-ве *Сіцылія* ў 2-й пал. 2 ст. да н.э. Пасля 2-й Пунічнай вайны Рым ператварыў Сіцылію ў сваю жытніцу. Узмацненне эксплуатацыі рабоў, што працавалі на латыфундыях, выклікалі хваляванні, якія перараслі ў паўстанні. 1-е паўстанне 136 (138 ці 137) — 132 да н.э. ўзначаліў раб-сірыец Еўн. Паўстанцы захапілі г. Эна і абвясцілі Еўна царом пад імем Антыёха. Другую армію паўстанцаў узначальваў

раб-кілікіец Клеон. Калі абедзве арміі аб'ядналіся, ён узначаліў 70-тыс. войска, якое захапіла гарады Таўраменій, Катану, Месану і інш. Былі створаны органы дзярж. кіравання: савет, нар. сход. У 132 да н.э. консул П.Рупілій задушыў паўстанне. Клеон загінуў у баі, Еўн памёр у турме. 2-е паўстанне (104—99 да н.э.) у паўд.-зах. частцы і ў цэнтры Сіцыліі ўзначаліў раб-італік Сальвій (абвешчаны царом пад імем Трыфона), а на захадзе в-ва — раб-кілікіец Афініён. Калі іх арміі аб'ядналіся, Афініён стаў стратэгам Трыфона, а калі той памёр — царом. Рым. армія пад кіраўніцтвам прэтараў Лукула, потым Гая Сервілія не здолела разбіць рабоў. У 101 да н.э. армія консула Манія Аквілія высадзілася ў Сіцыліі і ў 99 да н.э. задушыла паўстанне.

А.Г.Зельскі.

СІЦЫ́ЛІЯ (Sicilia), найбуйнейшы востраў у Міжземным м., тэр. Італіі. Аддзелены ад Апенінскага п-ва Месінскім пралівам. Пл. 25,46 тыс. км², з прылеглымі астравамі, што ўваходзяць у аўт. вобл. Сіцылія, 25,7 тыс. км². Нас. каля 5,5 млн. чал. (2001). Берагі стромкія, слаба парэзаныя, на паўн. і ўсх. узбярэжжах — зручныя бухты. Пераважае гарысты і ўзгорысты рэльеф. Паводле геал. будовы і рэльефу С. з'яўляецца працягам Апенінскага п-ва. У паўн. ч. крышт. горы Пеларытані (1374 м), пясчанікава-сланцавыя горы Небрады (1847 м) і вапняковы масіў Ле-Мадоніе (1975 м). Унутраная ч. в-ва — узгорыстыя ўзвышэнні з кангламератаў, пясчанікаў, мергеляў. На крайнім ПдУ — купалападобнае плато Іблеі (выш. да 986 м), у будове якога дамінуюць вапнякі і базальты. На Пн ад Іблеі плоская акумулятыўная раўніна Катанія. Характэрны неатэктанічнае падняцце, магутныя сейсмічныя і вулканічныя працэсы. На ПдУ — дзеючы вулкан *Этна* (3340 м), на Пн трапляюцца газевыя вулканы, гарачыя і тэрмамінер. крыніцы. Здабыча нафты, прыроднага газу, серы, калійнай і кухоннай солей, буд. матэрыялаў. Клімат субтрапічны міжземнаморскі. Сярэдняя т-ра студз. 11—12 °С, ліп. — 26—28 °С. Вясной і летам з боку Афрыкі дзьме гарачы вецер сірока, тады т-ра павышаецца да 40—45 °С. Ападкаў у гарах 750—1400 мм, на раўнінах — 400—450 мм за год. Рачная сетка развіта слаба. Рэкі невял., разліваюцца зімой і часта перасыхаюць летам. Расліннасць міжземнаморскага тыпу. У гарах да выш. 800—1000 м невял. ўчасткі цвердалістага лесу, маквісу на Пн, гарыгі на Пд. Вышэй — да 1300—1500 м каштанавыя і дубовыя лясы, якія змяняюцца букавымі. Над поясам лясоў — зараснікі калючых хмызнякоў. Лясы моцна высечаны і займаюць 4% плошчы. У цэнтры і на Пд востраў пераважаюць хмызнякі і стэпы. Жывёльны свет моцна вынішчаны. Вырошчваюць пшаніцу, цытрусавыя, масліны, вінаград. Авечкагадоўля. Рыбалоўства. Адм. цэнтр — Палерма. Буйныя гарады: Палерма, Месіна, Катанія, Сіракуза.

М.В.Лаўрыновіч.

СІЦЫ́ЛІЯ (Sicilia), аўтаномная вобласць Італіі. Займае в-аў *Сіцылія* і суседнія астравы. Пл. 25,7 тыс. км². Нас. каля 5,5 млн. чал. (2001). Уключае правінцыі: Агрыджэнта, Кальтанісета, Катанія, Месіна, Палерма, Рагуза, Сіракуза, Трапаніі, Эна. Адм. ц. — г. *Палерма*. С. — эканамічна адна з менш развітых абласцей Італіі. Каля пал. плошчы востраў пад с.-г. ўгоддзямі, у т.л. пад ворывам каля 770 тыс. га, пад садамі, вінаграднікамі і аліўкавымі гаямі — 350 тыс. га, пад лугамі і пашамі — 130 тыс. га. Значныя плошчы арашаюцца. Больш за 50% таварнай прадукцыі дае садоўніцтва (апельсіны, лімоны, аліўкі, вінаград). Вырошчваюць пшаніцу (пераважна цвёрдых гатункаў), бабовыя, раннюю бульбу, артышокі, агароднінныя культуры, асабліва памідоры (у асн. на экспарт). Гадуюць буйн. раг. жывёлу, авечак, коз, свіней, коней, мулаў, аслоў. Рыбалоўства і промысел морапрадуктаў. Асн. галіны прам-сці: горназдабыўная (сера, буд. матэрыялы, калійныя солі, нафта, прыродны газ), харч., дрэваапр., швейная, суднабудаўнічая. Новыя галіны: хім., цэм., эл.-тэхн., радыёэлектронная. Транспарт чыг., аўтамаб., марскі. Гал. парты Палерма, Аўгуста, Джэла. Праз Месінскі прал. С. злучана з Апенінскім п-вам паромам Месіна—Рэджа-ды-Калабрыя.

У старажытнасці в-аў Сіцылія насялялі плямёны сіканаў і сікулаў. У 8 ст. да н.э. С. — аб'ект фінікійскай і грэч. каланізацыі. У час Пелапанескай вайны 431—404 да н.э. С. беспаспяхова імкнуліся захапіць Афіны. З 5 ст. да н.э. авалодаць востравам імкнуўся Карфаген. Барацьба з карфагенскай экспансіяй асабліва абвастрылася пры сіракузскіх тыранах Дыянісію I і Агафокле. У 241 да н.э. С. стала першай рым. правінцыяй, жытніцай Рыма; тут адбыліся *Сіцылійскія паўстанні рабоў*. У 5 ст. н.э. яе захапілі вандалы, у 6 ст. — остготы. З 535 належала Візантыі. У 11 ст. заваявана *нарманамі*, у 12—13 ст. увайшла ў *Сіцылійскае каралеўства*, якое пасля паўстання *«Сіцылійская вячэрня»* ў 1282 распалася. У 1302 на востраве ўмацаваліся каралі *Арагона*. Паводле Утрэхцкага міру 1713 С. адышла да *Савойскага герцагства*, паводле Лонданскага дагавора 1720 замацавана за Аўстрыяй. У 1735—1860 тут правілі ісп. Бурбоны (гл. *Сіцылій абедзвюх Каралеўстваў*). У перыяд напалеонаўскага панавання ў Італіі на С. знаходзілася рэзідэнцыя неапалітанскага караля Фердынанда IV (у 1799—1802, 1806—1814). У 1861 С. ўвайшла ў Аб'яднанае Італьянскае каралеўства. У канцы 19 — пач. 20 ст. С. набыла вядомасць як радзіма *мафіі*. У 2-ю сусв. вайну ў чэрв. 1943 тут высадзіліся англа-амер. войскі (гл. *Сіцылійская аперацыя 1943*). У 1947 атрымала абласную аўтаномію.

СІЦЫЛІ́ЯНА (італьян. siciliana літаральна — сіцылійская), вакальная ці інстр. муз. п'еса, якая паходзіць, верагодна, ад сіцылійскага нар. танца або танц. песні. Муз. памер 6/8 ці 12/8, тэмп умераны. Мае пераважна светлы, ідылічны характар. З 17—18 ст. пашырана ў еўрап. прафес. музыцы. Развівалася пераважна ў 2 кірунках: сузіральным (пастаральным; гл. *Пастараль* у музыцы) і засмучана-элегічным, які ў прафес. музыцы ўяўляе сабой псіхал. насычэнне, характарызуецца мноствам няўстойлівых гукаў у мелодыі. Пашырана ў творчасці І.С.Баха, Г.Ф.Гендэля, Л.Бетховена, уласціва творам Ф.Шапэна, Р.Шумана, С.Рахманінава, П.Хіндэміта, А.Анегера, І.Стравінскага, Г.Свірыдава, Дз.Шастаковіча, К.Караева, Ю.Шапорына. Рытмічная арганізацыя, блізкая да С., сустракаецца і ў бел. музыцы (напр., фінал 3-й «Сімфоніі ў стылі барока» і вак. цыкле А.Мдывані на вершы Г.Апалінэра).

А.У.Валадковіч.

СІЦЫ́НСКІ Анастас Аляксандравіч (11.10.1862, г. Бабруйск Магілёўскай вобл. — ?), бел. вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі. Д-р медыцыны (1893), праф. (1912). Скончыў Маскоўскі ун-т (1887). У 1887—91 урач у Карэлічах, Мінску, чл. Мінскага навук. т-ва ўрачоў з 1890. З 1892 у Пецярбургу, з 1912 у Варшаўскім ун-це. Навук. працы па пытаннях акушэрства і гінекалогіі.

СІЦЬКО́ВА, вёска ў Мікалаеўскім с/с Міёрскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса. За 46 км на ПдУ ад г. Міёры, 165 км ад Віцебска, 26 км ад чыг. ст. Боркавічы. 246 ж., 85 двароў (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СІЭ́ТЛ (Seattle), горад на ПнЗ ЗША, штат Вашынгтон. Засн. ў 1851. 537 тыс. ж., з г. Такома і агульнымі прыгарадамі каля 2,5 млн. ж. (1998). Вузел чыгунак і аўтадарог, марскі порт. Міжнар. аэрапорт. Найбуйн. прамысл., гандлёва-фін., навук. і культ. цэнтр паўн. ч. Ціхаакіянскага ўзбярэжжа і ўсяго ПнЗ ЗША. Праз С. ідуць гал. сувязі з Аляскай і краінамі Д. Усходу. Адзін з найбуйнейшых цэнтраў авіяц. і ракетнакасм. прам-сці ЗША (праўленне, н.-д. лабараторыі і з-ды фірмы *«Боінг»*). Галіны прам-сці: суднабудаванне, радыёэлектронная, прыладабуд., аўтамаб., вытв-сць нафтавага абсталявання, дарожна-буд. машын, чыг. вагонаў, чорная металургія, нафтаперапр., дрэваапр., папяровая, паліграфічная. База рыбалоўства. 7 ун-таў. Тэатры, маст. музеі.

СІЯ́ЛАВЫЯ КІСЛО́ТЫ, аднаасноўныя поліаксіамінакіслоты, вытворныя *нейрамінавай кіслаты*. У звязаным стане (уваходзяць у састаў глікапратэідаў, глікаліпідаў і інш.) прысутнічаюць ва ўсіх тканках жывёл і чалавека, у некат. мікраарганізмах. У свабодным выглядзе выяўлены ў спіннамазгавой вадкасці, слізістай абалонцы страўніка, шчытападобнай залозе.

Бясколерныя крышталі, растваральныя ў вадзе, не растваральныя ў эфіры, мала — у метаноле. Моцныя к-ты. С.к. вызначаюць антыгенныя рэцэптарныя ўласцівасці паверхні клетак, удзельнічаюць ва ўзаемадзеянні клетак з вірусамі, таксінамі, гармонамі. Надаюць высокую вязкасць сакрэтам слізістых абалонак дыхальных і палавых шляхоў, страўніка, што ахоўвае іх ад мех. і хім. пашкоджанняў,

пранікнення бактэрый. Узровень С.к. у крыві павышаецца пры многіх запаленчых захворваннях, інфаркце міякарда, злаякасных пухлінах і інш., памяншаецца пры некат. прыроджаных захворваннях печані. *І.М.Семяненя.*

СІЯЛКО́Т, горад на ПнУ Пакістана, у прав. Пенджаб, за 15 км ад граніцы з Індыяй. Каля 400 тыс. ж. (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд., металаапр., тэкст., харч., гарбарна-абутковая. Вытв-сць хірург. і муз. інструментаў, спарт. інвентару. Цэнтр саматужных рамёстваў: выраб метал. посуду, ручное дыванаткацтва, разьбярства па дрэве і метале.

СІЯ́М, афіцыйная назва *Тайланда* да 1939 і ў 1945—48.

СІЯ́МСКІ ЗАЛІ́Ў. У Паўднёва-Кітайскім м., паміж п-вам Малака і паўд.-ўсх. ч. п-ва Індакітай. Даўж. 720 км, шыр. каля ўвахода 400 км, глыб. да 70 м. Прылівы сутачныя (да 4 м). Упадае р. Менам-Чао-Прая. Порт Бангкок (Тайланд).

СІЯ́МСКІЯ БЛІЗНЯ́ТЫ, аднаполыя *блізняты*, злучаныя паміж сабой; *загана развіцця*. Тэрмін «С.б.» з'явіўся ў 19 ст. пасля нараджэння ў 1814 у Сіяме братоў — Чанга і Хенга (па-кітайску правы і левы), злучаных у вобласці грудной клеткі і бёдраў. Частата нараджэння С.б. — 1 на 100—250 тыс. родаў. Маюць няпоўнае раздзяленне тулаваў, спалучэнне крывяносных сістэм і інш. С.б. бываюць сім. і асім. (адзін развіваецца нармальна, другі недаразвіты). Падвяргаюцца хірург. раздзяленню.

І.М.Семяненя.

СІЯНІ́ЗМ (ад назвы ўзгорка *Сіён* у г. Іерусалім), ідэалагічны і паліт. рух, разгалінаваная сістэма арг-цый, дзейнасць якіх накіравана на рэалізацыю ідэі адзінай сусветнай яўрэйскай нацыі; у вузкім сэнсе — афіц. палітыка дзяржавы *Ізраіль*. Сіянісцкі рух актывізаваўся ў 2-й пал. 19 ст., калі ў Еўропе і Паўн. Амерыцы ўзніклі першыя палесцінафільскія арг-цыі: «Сусветны саюз ізраэлітаў» (1860, Парыж), «Камітэт за эміграцыю яўрэяў Расіі» (1882, Парыж), «Таварыства для распаўсюджвання асветы сярод яўрэяў Расіі» (1863, С.-Пецярбург з аддзяленнямі ў Адэсе і Рызе) і інш. З 1880-х г. сіянісцкія групы дзейнічалі ў Кіеве, Львове, Палтаве, Кракаве. У 1882 у Расіі створана група «Ховеве-Цыён» («Сябры Сіёна») з аддзяленнямі ў Францыі, Вялікабрытаніі, ЗША. У ЗША сіяністы стварылі масонскі ордэн «Бнай Брыт» («Сыны Запавету», 1843), «Саюз амерыканскіх іудзейскіх кангрэгацый» (1873), «Цэнтральную канферэнцыю амерыканскіх рабінаў» (1889), «Федэрацыю яўрэйскіх жаночых арганізацый» (1896) і інш. арг-цыі і фонды. У 1897 існавала больш за 450 сіянісцкіх арг-цый у 28 краінах свету, выдавалася больш за 100 газет і часопісаў. У 1897 у г. Базель (Швейцарыя) адбыўся 1-ы сіянісцкі кангрэс, на якім створана *Сусветная сіянісцкая арганізацыя*, распрацаваны і зацверджаны яе статут і структура, выбраны кіраўнічыя органы, абвешчана праграма, дзе ў якасці першачарговай задачы выступала стварэнне яўр. дзяржавы ў Палесціне. Ідэйным ядром С. з'яўляецца канцэпцыя міру і адзінства ўсіх яўрэяў, незалежна ад іх сац. становішча і месца пражывання, а таксама ідэі «богавыбранасці» і «выключнасці» яўр. народа. Сіяністы выступаюць супраць асіміляцыі яўр. народа, у т.л. шляхам шлюбу з прадстаўнікамі інш. нацыянальнасцей. У межах сваіх канцэптуальных ідэй С. дапускае пэўны ідэалагічны плюралізм, чым абумоўлена неаднароднасць і шматварыянтнасць сіянісцкай ідэалогіі. У С. вылучаюцца кансерватыўная, ліберальная, дэмакратычная, сацыял-дэмакратычная, сацыяліст., камуніст. ідэйна-паліт. плыні, а таксама экстрэмісцкія кірункі: артадаксальна-клерыкальны, расісцкі. Валоданне велізарнымі капіталамі, кантроль над фінансамі, банкамі, страхавымі кампаніямі, вытв-сцю ўзбраення, інфармацыйна-вылічальнай тэхнікі і інш. галінамі прам-сці і сродкамі масавай інфармацыі, а таксама ўваходжанне ў склад паліт. эліты дазваляе прадстаўнікам С. ўплываць на развіццё сусв. эканомікі, эканам. міжнар. адносін. Вядучымі цэнтрамі эканам. і паліт. актыўнасці С. з'яўляюцца ЗША і Ізраіль. У 1975 С. асуджаны ААН як адна з форм расізму, у 1991 гэта рэзалюцыя скасавана.

На Беларусі з пач. 20 ст. дзейнічалі такія сіянісцкія партыі, як Паалей-Цыён (1906), Сіянісцка-сацыялістычная партыя (1904), Яўр. с.-д. рабочая партыя (1905), Мізрахі (сіянісцкая рэліг. арг-цыя, 1902) і інш. З канца 1920 — пач. 1930-х г. дзейнасць сіянісцкіх арг-цый у СССР была забаронена.

Літ.: Идеология и практика международного сионизма. М., 1978; Бегун В.Я. Вторжение без оружия. 3 изд. Мн., 1980; Корнеев Л.А. Классовая сущность сионизма. Киев, 1982; Джунусов М.С. Национализм: Словарь-справ. М., 1998; Лакер В. История сионизма: Пер. с англ. М., 2000.

В.І.Боўш.

СІЯ́НІН Міхаіл Данілавіч (17.12.1901, в. Забалацце Аршанскага р-на Віцебскай вобл. — 1.10.1973), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Вышэйшую кав. школу (1927), Ваен. акадэмію Генштаба (1941). У Чырв. Арміі з 1920. Удзельнік ліквідацыі антыбальшавіцкага кранштацкага паўстання 1921, сял. выступленняў на Тамбоўшчыне ў 1920—21, баёў з басмачамі. У Вял. Айч. вайну з ліст. 1941 на Калінінскім фронце. Механіз. брыгада на чале з палк. С. вызначылася ў вер. 1943 у баях за Дняпро каля в. Вял. Букрын на ПдУ ад Кіева. Да 1947 у Сав. Арміі. З 1966 дырэктар мемар. музея К.С.Заслонава (г. Орша).

СІЯ́НЬ, Сіань, горад у цэнтр. Кітаі, у даліне р. Вэйхэ (прыток Хуанхэ). Адм. ц. прав. Шэньсі. Каля 3 млн. ж. з прыгарадамі (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: металургічная, шматгаліновае машынабудаванне (вытв-сць станкоў, прылад, аўтамашын, трактароў, самалётаў), керамічная, тэкст., фармацэўтычная, лакафарбавая, харчовая. Ун-т. Музеі. Арх. помнікі 7—8, 14 ст.

М.Д.Сіянін.

У 1027—249 да н.э. тут знаходзіўся цэнтр фарміравання этнічнай супольнасці *чжоў* са стараж. сталіцамі Хао і Фэн. У 202 да н.э. тут засн. сталіца ханьскай імперыі Чан'ань, якая ў 3—6 ст. н.э. была сталіцай шэрагу паўн.-кіт. дзяржаў. У 583 на месцы сучаснага С. пабудавана новая сталіца Кітая г. Дасін (пазней перайменавана ў Чан'ань). У эпоху Тан (618—907) горад стаў паліт., эканам. і культ. цэнтрам Кітая. Перабудаваны паводле адзінага плана, ён стаў узорам для больш позняга горадабудаўніцтва. У 10 ст. паступова страціў б. значэнне. З 14 ст. адм. ц. акругі Сіянь, атрымаў сучасную назву. З 2-й пал. 17 ст. С. — адм. ц. правінцыі Шэньсі. У 1936 у С. адбыліся выступленні гаміньданаўскіх войск супраць урада *Чан Кайшы*. У 1949 горад вызвалены ад гаміньданаўцаў нар.-вызв. арміяй Кітая. У 1974 у выніку раскопак (вядуцца з 1956) каля С. выяўлена пахаванне імператара *Цынь Шыхуандзі* з тэракотавымі скульптурнымі выявамі воінаў. Пахаванне ў С. ўключана ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

Да арт. **Сіянь**. Пахаванне кітайскага імператара Цынь Шыхуандзі. Тэракотавыя скульптурныя выявы воінаў. 3 ст. да н.э.

СКАБАЛАНО́ВІЧ Мікалай Апанасавіч (1848, Гродзенская губ. — 10.11.1918), гісторык-візанцініст. Магістр. гісторыі

(1873). Скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію, з 1873 узначальваў там кафедру агульнай грамадзянскай гісторыі. У 1886—92 рэдактар час. «Церковный вестник». Асн. яго твор — «Візантыйская дзяржава і царква ў XI ст.» (1884), дзе на аснове грэч., лац. і ўсх. крыніц разглядаліся праблемы візант. адміністрацыі, суда, войска, царквы, мясц. кіравання, быў першай працай у рас. візанціназнаўстве. Сярод інш. прац найб. значныя: «Візантыйская навука і школы ў XI ст.», «Рэлігійны характар барацьбы асманскіх туркаў з грэка-славянскім светам», «Палітыка турэцкага ўрада ў адносінах да хрысціян і іх рэлігій», «Галілей перад судом рымскай курыі», «Раздзяленне цэркваў пры патрыярху Міхаіле Кіруларыю». *В.М.Чараніца.*

СКАБІЁЗА (Scabiosa), род кветкавых раслін сям. варсянкавых. Каля 100 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Афрыцы, пераважна ў Міжземнамор'і. На Беларусі 2 віды С.: галубіная (S. columbaria), занесеная ў Чырв. кнігу, трапляецца на парослых хмызняком пераўвільготненых лугавінах у далінах рэк, на вільготных узлесках, ускрайках балот, і жоўтая (S. ochroleuca), нар. назвы каўтуннік, папы, стараснік, расце на пясчанай глебе ў хваёвых лясах, уздоўж дарог. Характэрна для Пд рэспублікі. Інтрадукаваны С. каўказская (S. caucasica) і цёмна-пурпурная (S. atropurpurea).

Адна-, двух- і шматгадовыя травяністыя расліны выш. 20—80 см. Сцёблы прамастойныя, галінастыя, апушаныя. Лісце супраціўнае, суцэльнае або рассечанае. Кветкі ў верхавінкавых суквецціях, якія ўтвараюць густыя галоўкі накшталт кошыкаў складанакветных. Плод — арэх. Фарбавальныя, меданосныя, дэкар. расліны. *А.М.Скуратовіч.*

Скабіёза галубіная.

СКАБІ́НЬ, вёска ў Капыльскім с/с Капыльскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр с.-г. вытв. кааператыва. За 3 км на У ад г. Капыль, 128 км ад Мінска, 12 км ад чыг. ст. Цімкавічы. 498 ж., 200 двароў (2001). Дом культуры, б-ка. Брацкія магілы сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі радовішча жвірова-пясчанага матэрыялу *Скабін.*

СКАБІ́Н, радовішча жвірова-пясчанага матэрыялу ў Капыльскім р-не Мінскай вобл., за 1,5 км на ПнУ ад в. Скабін. Пластавы паклад звязаны з канцова-марэннымі адкладамі сожскага ледавіка. Жвірова-пясчаны матэрыял шараватажаўтаваты, з бурымі плямамі ажалязнення, месцамі гліністы, з праслоямі пяску; кандыцыйнага жвіру (буйней за 5 мм) 27,7%, ёсць уключэнні буйной галькі і дробных валуноў. Пясок у сумесі розназярністы, палевашпатава-кварцавы. Разведаныя запасы 45,9 млн. м^3, перспектыўныя 1,2 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 1,5—29,4 м, ускрышы (торф, пяскі, супескі) 0,2—10 м. Жвірова-пясчаны матэрыял прыдатны на выраб бетону, у дарожным буд-ве. *А.П.Шчураў.*

СКАБІЧЭЎСКІ Аляксандр Міхайлавіч (27.9.1838, С.-Пецярбург — 11.1.1911), рускі крытык, гісторык літаратуры. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1861). Друкаваўся з 1859. У 1868—84 супрацоўнік час. «Отечественные записки». Працы пераважна прысвечаны праблемам «народнай літаратуры», творчасці белетрыстаў-народнікаў (кн. «Белетристы-народнікі», 1888, і інш.). Аўтар драмы «Кругліцкія» (1862), цыклаў артыкулаў «Нарысы развіцця прагрэсіўных ідэй у нашым грамадстве» (1870—72; кніга спалена па прадстаўленні цэнзара), «Нарысы гісторыі рускай цэнзуры (1700—1863)» (1892), кн. «Гісторыя навейшай рускай літаратуры (1848—1890)» (1891), успамінаў, літ.-крытычных нарысаў пра А.Пушкіна, М.Лермантава, А.Грыбаедава, М.Дабралюбава, А.Пісемскага (выд. ў серыі «Жыццё выдатных людзей»).

Тв.: Литературные воспоминания. М.; Л., 1928.

Літ.: Коновалов В.Н. Народническая литературная критика: (П.Л.Лавров, П.Н.Ткачев, Н.К.Михайловский, А.М.Скабичевский). Казань, 1975.

СКАБЛО́ Барыс Германавіч (13.4.1923, г. Самара, Расія — 15.6.1999), бел. і расійскі віяланчэліст, педагог. Засл. арт. Беларусі (1967). Праф. (1984). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1949). У 1949—72 канцэртмайстар групы віяланчэляў Дзярж. акад. сімф. аркестра Беларусі, адначасова ў 1949—55 удзельнік стр. квартэта і фп. трыо Бел. філармоніі. З 1952 выкладаў у муз. школе пры Бел. кансерваторыі, з 1963 — у Бел. кансерваторыі. У 1987—98 праф. Рас. акадэміі музыкі ў Маскве. Удасканальваў жанр віяланчэльнага дуэта. Першы выканаўца многіх твораў бел. кампазітараў, у т.л. С.Аксакава, М.Аладава, А.Багатырова, у рэпертуары таксама рус. муз. класіка. Аўтар метадычных падручнікаў.

СКАБЯЛЬЦЫ́Н Дзмітрый Уладзіміравіч (24.11.1892, С.-Пецярбург — 16.11.1990), расійскі фізік і грамадскі дзеяч, заснавальнік навук. школы па фізіцы атамнага ядра і касм. прамянёў. Акад. АН СССР (1946, чл.-кар. 1939). Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Петраградскі ун-т (1915). З 1916 у ВНУ Ленінграда. У 1929—31 працаваў у лабараторыі М.*Складоўскай-Кюры.* З 1937 у Фіз. ін-це АН СССР (у 1952—72 дырэктар), адначасова ў 1946—60 дырэктар НДІ ядз. фізікі Маскоўскага ун-та (з 1940 праф.). У 1950—74 старшыня Камітэта па Міжнар. Ленінскіх прэміях. Навук. працы па ядз. фізіцы, фізіцы

Дз.У.**Скабяльцын**.

Р.С.**Скаварада**.

касм. прамянёў і фізіцы высокіх энергій. Выкарыстаў камеру Вільсана, змешчаную ў магн. поле, для даследаванняў узаемадзеяння γ-квантаў з рэчывам (1924), вынікі якіх пацвердзілі квантавую прыроду святла. Адкрыў наяўнасць у касм. прамянях зараджаных часціц высокіх энергій і паяўленне груп з некалькіх (да 4) генетычна звязаных часціц (т.зв. касм. ліўні; 1927—29), што дало пачатак даследаванню прыроды касм. прамянёў. Залаты медаль імя Ламаносава 1952. Дзярж. прэмія СССР 1951. Ленінская прэмія 1982.

Тв.: Космические лучи. Л.; М., 1936; Парадокс близнецов в теории относительности. М., 1966.

СКАВАРАДА́ Рыгор Савіч (3.12.1722, г.п. Чарнухі Палтаўскай вобл., Украіна — 9.11.1794), украінскі філосаф, пісьменнік і педагог. У 1734—41, 1744—45, 1751—53 вучыўся ў Кіева-Магілянскай духоўнай акадэміі (яго настаўнікам па філасофіі быў Г.*Каніскі*). У 1745—50 у складзе пасольскіх місій быў у Венгрыі, Аўстрыі, Рэчы Паспалітай і інш. У 1750—51 выкладаў у Пераяслаўскім, у 1759—69 — у Харкаўскім калегіумах. У далейшым вандраваў па Украіне як філосаф-прапаведнік. У цэнтры яго філасофіі, выкладзенай у трактатах, дыялогах і прытчах, — канцэпцыя бачнай (матэрыя) і нябачнай (Бог) натур. Паводле С., боскі пачатак патаемна прысутнічае ва ўсёй прыродзе, і гал. задача чалавека — спасціжэнне нябачнай прыроды праз бачную («Пачатковыя дзверы да хрысціянскай дабрачыннасці», 1766—80). Лічыў, што ў кожнай асобе закладзена боская прырода, усведамленне Бога адбываецца праз самапазнанне («Наркіс», канец 1760-х г.). Адрозніваў першае нараджэнне чалавека (фізічнае) і другое (духоўнае), калі

чалавек атрымлівае сапраўдную свабоду праз спасціжэнне боскай сутнасці. Сусвет падзяляў на 3 часткі: макракосм (прырода), мікракосм (чалавек) і сімвалічны свет (Біблія). Лічыў, што асн. сродкам увядзення чалавека ў духоўны свет з'яўляецца сімвал («Дыялог. Імя яму — Патоп змеяў», канец 1780-х г.), што хрысціянства і ант. культура маюць агульную духоўную аснову. Сац. погляды С. грунтуюцца на ідэі прызначэння Богам кожнага чалавека да пэўнага віду дзейнасці (земляробства, вайсковай справы, багаслоўя). Пед. канцэпцыя С. заснавана на ідэі выхавання дзіцяці ў адпаведнасці з яго асабістай прыродай. Лічыў, што выхаванне павінна пачынацца яшчэ да фіз. нараджэння чалавека. Літ. творчасць С. эмацыянальна-вобразна адлюстроўвае яго філас. ідэі. Яго паэзія спалучае пафаснасць, манументалізм і лірычнасць, творчае пераасэнсаванне біблейскіх матываў і нар. песеннай культуры (цыкл «Сад божых песень, праросłых з зярнят Свяшчэннага Пісання», 1753—85). Развіваў жанр празаічнай байкі, дзе ў сатырычна-алегарычнай форме крытыкаваў грамадскія заганы, ухіленне чалавека ад духоўнай культуры (цыкл «Байкі харкаўскія», 2-я пал. 1760-х г. — 1774). Ідэі С. паўплывалі на развіццё ўсх.-слав. рэліг. філасофіі і л-ры.

Тв.: Рус. пер. — Избранное: Песни, басни, притчи. М., 1972; Соч. Т. 1—2. М., 1973; Соч. Мн., 1999.

Літ.: Барабаш Ю.Я. «Знаю человека...»: Григорий Сковорода. Поэзия. Философия. Жизнь. М., 1989; Гарин И. Сковорода // Гарин И. Пророки и поэты. М., 1994. Т. 3; Кравец В.В. Разговор о Сковороде: С приложением хрестоматии по сковородоведению. Київ, 2000; Эрн В. Г.Сковорода: Жизнь и учение // Эрн В. Борьба за логос; Г.Сковорода: Жизнь и учения. Мн.; М., 2000.

Н.Г.Кісялёва.

СКАВАРО́ДНІК, у беларусаў печыва з хлебнага цеста, якое ўжо замешана, але яшчэ не падышло. Цеста абгладжваюць вадой, пальцам робяць дзірачкі, каб не расколвалася. Часам у цеста дадаюць драную бульбу. Пякуць на патэльні пры агні або на гарачым вуголлі. Калі пякуць прама на чарэні, называюць таксама праснак, выхапень, хапун, перапечка, сачэнь і інш. Вядомы па ўсёй Беларусі.

СКАГЕРА́К (Skagerrak), праліў паміж п-вамі Ютландыя і Скандынаўскі; зах. з *Дацкіх праліваў*. Даўж. 225 км, шыр. 60—150 км, глыб. да 809 м (Нарвежскі жолаб), найменшая глыб. на фарватэры 53 м. Гал. порт — Осла (Нарвегія).

СКАГЕРА́КСКАЯ БІ́ТВА 1916, гл. ў арт. *Ютландская бітва 1916*.

СКАДА́РСКАЕ ВО́ЗЕРА, Шкодэр, возера ў Югаславіі (Чарнагорыі) і Албаніі, самае вял. на Балканскім п-ве. Пл. 356—388 км^2 (мяняецца па сезонах). Глыб. да 44 м. Сцёк па р. Буна ў Адрыятычнае м. Усх. і паўн. берагі нізкія, зах. і паўд.-зах. гарыстыя. Суднаходства. Рыбалоўства. Каля паўд.-ўсх. ўзбярэжжа г. Шкодэр (Албанія).

СКАЗ, 1) у мовазнаўстве — камунікатыўна-сінтаксічная адзінка, якая складаецца са спалучэння слоў ці асобнага слова і служыць для выражэння думкі або пачуцця.

Гал. асаблівасці С. — камунікатыўнасць, прэдыкатыўнасць, грамат. афармленасць, сэнсавая і інтанацыйная закончанасць. Камунікатыўнасць заключаецца ў тым, што С. служыць асн. сродкам моўных зносін, прызначаны для паведамлення пра з'явы і падзеі аб'ектыўнай рэчаіснасці. Прэдыкатыўнасць выражае ацэнку рэчаіснасці, паказвае, што сцвярджаецца або адмаўляецца ў С. Яна рэалізуецца пры дапамозе сінтакс. мадальнасці і сінтакс. часу, якія вызначаюць адносіны таго, пра што паведамляецца, да рэчаіснасці і канкрэтнага часу (цяперашняга, прашлага, будучага) і выражаюцца дзеяслоўнымі катэгорыямі *ладу*, *часу* і *асобы*, а пры іх недастатковасці або адсутнасці — мадальнымі словамі, *часціцамі*, інтанацыяй.

Словы і спалучэнні слоў у С. заўсёды граматычна арганізаваны сінтакс. сувязямі і адносінамі ў цэласнае адзінства, якое змяшчае асобную думку, пачуццё і вызначаецца адноснай сэнсавай і інтанацыйнай закончанасцю: «Лёгкі ветрык чуць прыкметна збажыну калыша» (Я.Купала). У залежнасці ад колькасці прэдыкатыўных асноў (адна ці болей) дзеляцца на *простыя сказы* і *складаныя сказы*. Пэўным чынам арганізаваная паслядоўнасць С. стварае звязны *тэкст*, які ляжыць у аснове твораў маст., публіцыстычнай і інш. л-ры.

2) У музыцы — найбольшая частка *перыяду*, якая заканчваецца *кадэнцыяй*. Звычайна існуе як частка цэлага, зрэдку набывае самаст. значэнне (у незамкнутай гал. партыі *санатнай формы*). У простай 3-часткавай форме С. можа выконваць функцыю перыяду як формы яе частак. Паводле канцэпцыі класічнай ням. муз.-тэарэт. школы (Г.*Рыман*), усякая 1-часткавая пабудова без кадэнцыі ў сярэдзіне яе з'яўляецца С., у гэтым выпадку перыяд, што не падзяляецца на С., трактуецца як С.

Літ.: Беларуская граматыка. Ч. 2. Сінтаксіс. Мн., 1986; Гл. да арт. *Форма музычная*.

Л.І.Бурак (мовазнаўства).

«СКАЗА́ННЕ ПРА БАРЫ́СА І ГЛЕ́БА», адзін з найб. ранніх помнікаў стараж.-рус. агіяграфічнай л-ры. Створана невядомым аўтарам у канцы 11 ст. (паводле інш. меркаванняў, у пач. 12 ст.). Захавалася больш чым у 170 спісах. Адносіцца да жыцій-марцірый (ад грэч. marturos сведка, пакутнік).

У аснову «Сказання...» пакладзены драм. эпізод забойства сыноў кіеўскага князя Уладзіміра Барыса і Глеба іх братам Святаполкам. У адрозненне ад кананічнай формы візант. *жыція*, не гаворыцца пра іх імкненне прысвяціць сябе служэнню Богу і г.д. Паводле агіяграфічнага канона, вызначаецца ўмоўнасцю сюжэтных сітуацый, рытарычнасцю, этыкетнасцю паводзін і моўных формул персанажаў. Характарыстыкі гал. герояў схематычныя, пазбаўлены яркіх індывідуальных рыс. Разам з тым аўтар тонка перадаў псіхал. стан Барыса і Глеба перад забойствам, імкнуўся да дакладнага абазначэння падзей і фактаў (згадаў гіст. мясціны і імёны), надаў твору выключную эмацыянальнасць. Вял. месца ў «Сказанні...» займаюць унутраныя маналогі, плачы, ёсць вытрымкі са Свяшчэннага пісання.

«Сказанне...» — твор тэндэнцыйны: у ім асуджаецца братазабойства, сцвярджаюцца ідэі родавага старшынства (з мэтай узмацнення паліт. адзінства ўсх.-слав. зямель), паліт. і рэліг. незалежнасці Русі. Сюжэт «Сказання...» карыстаўся вял. папулярнасцю. Вядома каля 255 спісаў помнікаў пра Барыса і Глеба, у т.л. «Чытанне пра жыццё і гібель... Барыса і Глеба», Нестара, «Жыціе Барыса і Глеба» і інш. Пытанні пра іх узаемадзеянне і храналогію складаныя і не высветлены. «Сказанне...» было добра вядома на Беларусі. Бытавала ў складзе пралогаў, чэцыяў-мінеі і інш. зборнікаў. Адзін са спісаў твора захаваўся ў Чэцці 1489. Сюжэт «Сказання...» выкарыстаны ў п'есе «Духоўнае прычасце святых Барыса і Глеба», што ставілася ў Полацку (каля 1693).

Публ.: Памятники литературы древней Руси: Начало рус. лит., XI — начало XII в. М., 1978.

Літ.: Абрамович Д.И. Жития святых мучеников Бориса и Глеба и службы им. Пг., 1916; Бугославский С. Українсько-руські пам'ятки XI—XVIII вв. про князів Бориса та Гліба. Київ, 1928; Воронин Н.Н. «Анонимное» сказание о Борисе и Глебе, его время, стиль и автор // Тр. Отд. древнерусской литературы. М., 1957. Т. 13; Еремин И.П. «Сказание» о Борисе и Глебе // Еремин И.П. Литература древней Руси: (Этюды и характеристики). М.; Л., 1966; Словарь книжников и книжности древней Руси. Л., 1987. Вып. 1. С. 398—408.

У.Г.Кароткі.

«СКАЗА́ННЕ ПРА ВІ́ЛЕНСКІХ ПАКУ́ТНІКАЎ ІАА́НА, АНТО́НІЯ, ЯЎСТА́ФІЯ», «Жыціе віленскіх (літоўскіх) пакутнікаў», помнік бел. перакладной агіяграфічнай л-ры 15 ст. Напісана ў Візантыі ў 3-й чвэрці 14 ст. напачатку, верагодна, пагрэчаску, пасля перакладзена на царк.-слав. мову. У жыціі коратка выкладзена гісторыя пра трох язычнікаў з «Літоўскай зямлі», якія перайшлі ў хрысціянства, сталі гарачымі прыхільнікамі новай веры і дачасна скончылі жыццё пакутніцкай смерцю: паводле загаду князя іх павесілі. У аснову твора пакладзены, відаць, сапраўдны факт, але ён апісаны вельмі сцісла, даволі трафарэтна і схематычна. У жыціі мала гіст. рэалій, канкрэтных быт. дэталей, жыццёвай праўды. Толькі ў спісах усх.-слав. паходжання згадваецца літ. кн. Альгерд, адзначаецца, што падзеі адбываліся ў Вільні і падаюцца язычніцкія імёны герояў — Круглец, Няжыла, Кумец. «Сказанне...» бытавала ў розных зборніках, унесена ў «Вялікія Мінеі Чэцці» Макарыя (16 ст.), аднак бел.-літ. летапісы і хронікі гісторыю пра трох віленскіх пакутнікаў не адзначаюць. Самыя стараж. спісы — Віленскі і Бялградскі (15 ст.).

Літ.: Сперанский М.Н. Сербское житие литовских мучеников. М., 1909.

В.А.Чамярыцкі.

«СКАЗА́ННЕ ПРА МАМА́ЕВА ПАБО́ІШЧА», гл. «*Мамаева пабоішча*».

«СКАЗА́ННЕ ПРА СІВІ́ЛУ-ПРАРО́ЧЫЦУ», помнік перакладной бел. л-ры. Змешчана ў рукапісным зборніку 16 ст., які належаў бібліятэцы Красінскіх у Варшаве. На старабел. мову перакладзена з чэшскай у 15 — пач. 16 ст. (трапляюцца царкоўнаславянізмы, паланізмы і чэхізмы). Уключае некалькі біблейскіх і апакрыфічных апавяданняў. Пачынаецца сюжэтам пра царыцу краіны Савы (паводле падання, была на Пд Аравіі), якая атаясамліваецца з Сівілай — адной з вандроўных варажбітак у Стараж. Грэцыі, пра яе знаёмства з біблейскім царом Саламонам. Далей змешчаны аб'яднаныя ў адно цэлае прароцтвы Сівілы Саўскай пра нараджэнне і вучэнне Хрыста, пашырэнне хрысціянства, з'яўленне антыхрыста, другі прыход Хрыста і канец свету.

Публ.: Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы. Ч. 1. Мн., 1961.

Літ.: Карский Е.Ф. Западнорусское сказание о Сивилле-пророчице по рукописи XVI в. // Карский Е.Ф. Тр. по белорусскому и другим славянским языкам. М., 1962.

У.М.Свяжынскі.

СКА́ЗКІН Сяргей Данілавіч (19.10.1890, г. Новачаркаск Растоўскай вобл., Расія — 14.4.1973), савецкі гісторык-медыявіст, акадэмік АН СССР (1958). Герой Сац. Працы (1970). Скончыў Маскоўскі ун-т (1915), з 1920 выкладаў у ім (з 1949 заг. кафедры). З 1962 заг. сектара гісторыі сярэдніх вякоў Ін-та гісторыі АН СССР. Асн. працы па праблемах сярэдневяковай гісторыі (агр. адносіны, гісторыя зах.-еўрап. сялянства; ератычныя рухі, абсалютызм, Адраджэнне), гісторыі дыпламатыі і інш. Аўтар і рэдактар падручнікаў для ВНУ па гісторыі сярэдніх вякоў, адзін з аўтараў «Гісторыі дыпламатыі» (т. 1, 1941; 2-е выд., 1959), «Усеагульнай гісторыі» (т. 3—4, 1957—58), «Гісторыі Францыі» (т. 1, 1972). Дзярж. прэмія СССР 1942.

Тв.: Очерки по истории западноевропейского крестьянства в средние века. М., 1968; Избранные труды по истории. М., 1973; Из истории социально-политической и духовной жизни Западной Европы в средние века. М., 1981.

«СКА́ЙЛЭБ» (англ. Skylab ад sky laboratory нябесная лабараторыя), амерыканская эксперыментальная *арбітальная станцыя* для палёту па каляземнай арбіце; таксама праграма яе распрацоўкі, запуску і эксплуатацыі. Прызначалася для вывучэння ўздзеяння бязважкасці на арганізм чалавека ў час працяглых касм. палётаў, правядзення навук.-тэхн. і тэхнал. эксперыментаў, даследаванняў Сонца, прыродных рэсурсаў Зямлі і інш. Выведзена на арбіту 14.5.1973 ракетай-носьбітам «Сатурн-5» (без экіпажа). Маса 77 т, даўжыня 25 м. Аб'ём жылых адсекаў каля 340 м^3.

Станцыя складалася з асн. блока (лабараторны і бытавы адсекі), прыборнага адсека, шлюзавай камеры (забяспечвала выхад касманаўтаў у адкрыты космас), прычальнай канструкцыі з асн. і рэзервовым стыковачнымі вузламі і платформы з комплексам астр. прылад. Не прызначалася для вяртання на Зямлю, дастаўка і змена экіпажаў праводзіліся пры дапамозе трансп. касм. карабля *«Апалон»*. У 1973—74 на станцыі працавалі 3 экіпажы касманаўтаў (па 3 чал.). Макс. працягласць палёту 84 сут. З лютага 1974 у аўтам. рэжыме, 9.7.1979 спыніла існаванне. Іл. гл. да арт. *Арбітальная станцыя.*

У.С.Ларыёнаў.

С.Д.Сказкін.

СКАКУ́Н Аляксей Сцяпанавіч (н. 1.3.1946, в. Дастоева Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны-эканаміст. Канд. эканам. н. (1987). Чл.-кар. Акадэміі агр. навук Рэспублікі Беларусь (1995). Засл. работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1993). Скончыў Гродзенскі с.-г. ін-т (1969). З 1973 нам. старшыні, з 1975 старшыня калгаса. З 1979 нач. с.-г. ўпраўлення Іванаўскага р-на, з 1982 старшыня с.-г. калектыўнага прадпрыемства «Астрамечава» Брэсцкага р-на. Навук. працы па праблемах аграпрамысл. эканомікі, агародніцтва, рэнтабельнасці с.-г. прадпрыемстваў, АПК ва ўмовах пераходу да рыначнай эканомікі.

Тв.: Ориентир — новые высоты. Мн., 1986; Деревенская политэкономия. М., 1990; Дорога в завтра: Колхоз-комбинат «Память Ильича». Мн., 1992; Реструктуризация убыточных хозяйств — веление времени // Бел. думка. 1999. №11 /12; Право на жизнь. Мн., 2001.

СКАКУНЫ́ (Cicindela), род жукоў сям. жужаляў (вылучаюць і падсям. С.: — Cicindelinae). Каля 200 відаў. Пашыраны ў Паўн. паўшар'і. Жывуць на травяністых месцах, на пяску. Перамяшчаюцца скачкападобнымі пералётамі (адсюль назва). На Беларусі адзіны від — С. пясчаны, або арэнарыя (C. arenaria), занесены ў Чырв. кнігу.



Скакуны: 1 — пурпуровы; 2 — шасцікрапінкавы; 3 — пясчаны, або арэнарыя; 4 — лічынка.

Даўж. 6,5—22 мм. Цела ярка афарбаванае, пераважна з белым малюнкам на надкрылах. Галава вял., вочы пукатыя, сківіцы серпападобныя. Дзённыя драпежнікі, кормяцца пераважна насякомымі.

СКАКУНЫ́, павукі-скакуны (Salticidae), сямейства павукоў. Каля 3 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў тропіках. Трапляюцца на глебе, дрэвах, у траве і інш. На Беларусі каля 15 відаў.

Даўж. цела 2—9 мм. Покрыва шчыльнае, часта стракатае і ярка афарбаванае, асабліва ў самцоў. Галавагрудзі спераду прыўзнятыя, ззаду сплюшчаныя. Вочы размешчаны ў 3 рады, у пярэднім — 4 вокі, у задніх — па 2. Актыўныя ўдзень. Характэрны т.зв. «шлюбныя танцы». Кормяцца насякомымі. На здабычу скачуць, перамяшчаюцца скачкамі (адсюль назва).

«СКАКУ́ХА», бел. нар. танец. Муз. памер 2/4. Тэмп ад умеранага да хуткага. Танец імправізацыйнага характару, выконваецца весела, разгульна, пад прыпеўкі гумарыст. зместу. Дробныя рухі ног (дробушкі) спалучаюцца з хуткімі вярчэннямі і размахваннем хусткай. «С.» танцуюць жанчыны на дажынках, «каравайніцы» на вяселлях (т.зв. бабскія скакухі). Зафіксаваны ў 1-й пал. 19 ст., быў вельмі пашыраны на Беларусі са значнымі рэгіянальнымі адрозненнямі.

Л.К.Алексютовіч.

СКАЛАБА́Н Віталь Уладзіміравіч (н. 5.8.1947, в. Шылавічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. гісторык, літаратуразнавец. Канд. гіст. н. (1987). Скончыў Ленінградскі ун-т (1970). З 1972 у выд-ве «Беларуская Энцыклапедыя» (у 1992—95 заг. рэдакцыі). З 1995 нам. дырэктара, з 1997 саветнік Бел. НДІ дакументазнаўства і архіўнай справы. З 2000 нам. дырэктара Нац. навукова-асв. цэнтра імя Ф.Скарыны, з 2002 у Нац. архіве Рэспублікі Беларусь. Даследуе гісторыю бел. нац. руху, культуры 19.— пач. 20 ст., пытанні архівазнаўства, краязнаўства і бібліяграфіі. Увёў у навук. ўжытак невядомыя тэксты бел. л-ры 19 ст. (у зб. «Шляхам гадоў», 1990), гіст.-літ. матэрыялы пра жыццё і творчасць бел. пісьменнікаў, грамадскіх і культ. дзеячаў («Гарэцкі М. Публіцыстыка 1918—1919 гг.», укл. з В.Дз.Селяменевым, 2000) і інш. Адзін са складальнікаў бібліягр. дапаможнікаў «М.М.Улашчык» (1996), «Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы» (1997), «Бібліятэка Міхася Мялешкі» (1998), «Р.П.Платонаў» (2000), «М.В.Доўнар-Запольскі» (2001). Рэдактар-складальнік кн. «Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Ляхавіцкага раёна» (1989). Сааўтар сцэнарыяў дакумент.-маст. фільмаў пра

Ц.Гартнага, У.Ігнатоўскага, Я.Купалу і інш.

Тв.: Працяг гісторыі з «Дзядзькам Антонам» //Полымя. 1988. №2; Издательская деятельность Белорусского национального комиссариата (1918—1920 гг.) // История книги, книжного дела и библиографии в Белоруссии. Мн., 1986; «Хай ведаюць патомкі...»: Алесь Гарун — дэлегат і гісторык Усебеларускага з'езда 1917 г. // Роднае слова. 1997. №8; Дакументальная спадчына Усебеларускага з'езда 1917 г.: прабл. збору, захавання і выдання // Архівы і справаводства. 2000. №1.

І.У.Саламевіч.

выкапнёвыя рэшткі сківіц драпежных многашчацінкавых чарвей. Маюць выгляд чорных вызубленых скрыўленых пласцінак даўж. 0,3—3 мм. Складаюцца з хіцінавага рэчыва, часам з уключэннямі вапны. На тэр. Беларусі выяўлены ў адкладах ардовіку, сілуру, дэвону, карбону (каля 500 млн. г. назад і пазней). Служаць для вызначэння ўзросту геал. адкладаў.

СКАЛІЁЗ, тое, што *скрыўленне пазваночніка.*

1 2 3 4

Скакуны (павукі): 1 — геліяфанус энеус; 2 — геліяфанус купрэус; 3 — эрыс трыкалор; 4 — фіяле флавагутатус.

СКАЛАЛА́ЖАННЕ спартыўнае, праходжанне скальных маршрутаў з улікам хуткасці і складанасці пад'ёму; від *альпінізму*. Уключае індывід. ўзыходжанні без прыстасаванняў і камандныя — двух спартсменаў, якія ўзаемадзейнічаюць у звязцы пры выкарыстанні спец. прылад і рыштунку. Спаборніцтвы праводзяцца на крутых скалах выш. каля 100 м. Узнікла С. ў СССР у 1930-я г. На Беларусі Федэрацыя альпінізму і скалалажання існуе з 1955. Чэмпіянаты рэспублікі па С. праводзяцца з 1973. Найб. актыўна развіваецца С. ў гарадах Бабруйск, Барысаў, Гомель, Жлобін, Ліда, Магілёў, Мінск, Пінск. Штучныя скаладромы пабудаваны ў Гомелі і Мінску. У міжнар. спаборніцтвах найб. вызначыліся Дз.Бычкоў, А.Дыбанаў, В.Хананаў, С.Шафераў (1999—2001) і інш. *В.С.Кахненка.*

СКАЛАПЕ́НДРАВЫЯ (Scolopendromorpha, або Scolopendrida), атрад беспазваночных жывёл кл. губаногіх. 2 сям.: крыптапіды (Cryptopidae) і скалапендры (Scolopendridae). Каля 900 відаў. Большасць пашыраны ў тропіках і субтропіках, глебавыя С. трапляюцца ў стэпавай і лясной зонах Усх. Еўропы. Жывуць пад камянямі, бярвёнамі, у расколінах скал, глебы і інш.

Даўж. да 30 см. Цела пляскатае ў спінна-брушным напрамку, складаецца з членікаў, на большасці якіх ёсць дыхальцы. Спіна скурыстая, звычайна цямнейшая за брушка. Скалапендры па баках галавы маюць вочы, якія складаюцца са скопішчаў простых вочак, крыптапіды — сляпыя. Развіццё з *эпімарфозам*. Кормяцца ў асн. беспазваночнымі, буйныя — і дробнымі пазваночнымі. Многія ядавітыя, ядомыя.

СКАЛЕКАДО́НТЫ [Scolecodontes ад грэч. scōlēx чарвяк + odys(odontos) зуб], выкапнёвыя рэшткі сківіц драпежных многашчацінкавых чарвей. Маюць выгляд чорных вызубленых скрыўленых пласцінак даўж. 0,3—3 мм. Складаюцца з хіцінавага рэчыва, часам з уключэннямі вапны. На тэр. Беларусі выяўлены ў адкладах ардовіку, сілуру, дэвону, карбону (каля 500 млн. г. назад і пазней). Служаць для вызначэння ўзросту геал. адкладаў.

СКАЛІ́СТЫЯ ГО́РЫ (Rocky Mountains), усходняя частка сістэмы *Кардыльер* Паўн. Амерыкі на З Канады і ЗША, паміж 60° і 32° паўн. шыраты. Даўж. каля 3200 км, шыр. да 700 км. Сфарміраваліся ў ларамійскую складкаватасць. Паводле характару рэльефу падзяляюцца на 3 часткі: Паўночную (на Пн ад 45°), якая характарызуецца кампактнасцю і працягласцю хрыбтоў, складзеных з гранітаў, шырокім развіццём ледавіковых форм, выш. да 3954 м (г. Робсан); Сярэднюю (паміж 45° і 41° паўн. ш.) з шырокімі хрыбтамі са згладжанымі вяршынямі, падзеленымі шырокімі тэктанічнымі паніжэннямі і плато; Паўднёвую (на Пд ад 41° паўн. ш.) найб. шырокую і высокую (г. Элберт, 4399 м), перасечаную глыбокімі каньёнамі рэк. Кароткія хрыбты размешчаны кулісападобна, складзены з вапнякоў, гліністых сланцаў і пясчанікаў, чаргуюцца з вялізнымі басейнамі — «паркамі». Радовішчы малібдэну, фасфарытаў, медзі, золата, серабра, поліметалаў, нафты, каменнага вугалю. Вулканічныя з'явы (гейзеры, тэрмальныя крыніцы), землетрасенні. Клімат кантынент., умераны, на Пд субтрапічны, сухі, асабліва ў паніжэннях і на ўсх. схілах. На вяршынях і зах. схілах ападкаў да 1000 мм за год. Выш. снегавой мяжы 4000 м на Пд, 2500 м на Пн. С.г. — водападзел паміж бас. Ціхага і Атлантычнага акіянаў. Тут бяруць пачатак рэкі: Місуры, Каларада, Рыо-Грандэ, Снейк, Арканзас і інш. Расліннасць — пераважна лясы, на Пн — горнатаежныя, падымаюцца да выш. 1500 м, і рэдкалессі, горная тундра; на Пд хваёвыя лясы — да выш. 3600 м, вышэй субальпійскія, альпійскія лугі і вечныя снягі. У далінах — стэпы і паўпустыні. Буйныя нац. паркі: Джаспер, Банф, Іоха, Глейшэр (Канада), Йелаўстонскі, Рокі-Маўнтын (ЗША). *М.В.Лаўрыновіч.*

СКАЛО́ДЗІНА, Скалодзінка, рака ў Мазырскім і Петрыкаўскім р-нах Гомельскай вобл., правы прыток р. Прыпяць. Даўж. 42 км. Пл. вадазбору 275 км^2. Пачынаецца каля в. Зялёны Мох Мазырскага р-на, цячэ па раўніне Мазырскае Палессе, працякае праз воз. Глініцкае. Упадае ў старарэчча р.Прыпяць каля в.Шастовічы Петрыкаўскага р-на. Даліна пераважна невыразная, зліваецца з навакольнай мясцовасцю, месцамі трапецападобная, шыр. 0,3—1,2 км. Пойма перарывістая, на асобных участках чаргуецца па берагах, вузкая, у ніжнім цячэнні зліваецца з поймай р. Прыпяць. Рэчышча звілістае, шыр. ракі ў межань 5—7 м, ніжэй воз. Глініцкае больш за 11 м.

СКАЛО́ТЫ, адна з саманазваў усіх або адной груп прычарнаморскіх *скіфаў*, пра якую піша *Геродот* (5 ст. да н.э.) у 4-й кнізе сваёй гіст. працы; сцвярджае таксама, што назва «С.» паходзіць ад скіфскага «цар». Некат. вучоныя мяркуюць, што С. наз. скіфы-земляробы.

СКАЛЬПАВА́ННЕ (ад лац. scalpere скабліць), ваенны звычай некат. народаў, паводле якога ў якасці трафея здымалі скальп. Было вядома ў стараж. народаў (галаў, скіфаў). У 17—19 ст. звычай С., які раней існаваў ва ўсх. і паўд.-ўсх. частцы Паўн. Амерыкі (іракезы і інш.), распаўсюдзіўся і ў інш. індзейскіх плямён пад уплывам англ. і франц. каланізатараў, якія плацілі індзейскім «саюзнікам» за скальпы воінаў варожых ім плямён.

СКА́ЛЬСКІ Сцяпан Уладзіміравіч (15.1.1899, Мінск — 29.12.1972), бел. акцёр. Засл. арт. Беларусі (1940). Скончыў Бел. драм. студыю ў Маскве (1926). Працаваў у тэатрах Харкава і інш. гарадоў (1917—19), на Бел. радыё (1932—35, маст. кіраўнік), у Белдзяржэстрадзе (1948—52), Бел. т-ры імя Я.Коласа (1926—32, 1937—48, 1952—65). Характарны акцёр. Сярод роляў у т-ры імя Я.Коласа: Мартын Рыль, Шышла («У пушчах Палесся», «Вайна вайне» Я.Коласа), Дубавец («Проба агнём» К.Крапівы), пан Бараноўскі («Несцерка» В.Вольскага), Абабурка («Пагібель воўка» Э.Самуйлёнка), Мікола Барановіч («Каля тэрасы» М.Грамыкі), Пётр, поп Паўлін («Мяшчане», «Ягор Булычоў і іншыя» М.Горкага), Косця («Дзеці Ванюшына» С.Найдзёнава), Астап («Астап» А.Глобы), Павел Паўлавіч («Рэйкі гудуць» У.Кіршона), фон Штубэ («Разлом» Б.Лаўранёва), Сысоеў («Першая конная» У.Вішнеўскага).

СКАЛЬФА́РА (Scalfaro) Оскар Луіджы (н. 9.9.1918, г. Навара, Італія), італьянскі дзярж. і паліт. дзеяч. Скончыў Каталіцкі ун-т у Мілане. З 1948 дэп. парламента ад Хрысц.-дэмакр. партыі. У роз-

ныя гады займаў розныя пасады ў парламенце і ўрадзе, узначальваў міністэрствы транспарту і грамадз. авіяцыі, адукацыі; абіраўся нам. спікера ніжэйшай палаты парламента. У 1983—87 міністр унутр. спраў Італіі. З мая 1992 — прэзідэнт Італьян. Рэспублікі.

СКАЛЯ́Р (франц. scalaire ад лац. scalaris ступеньчаты), скалярная велічыня, фізічная велічыня, кожнае значэнне якой (у адрозненне ад *вектара*) выражаецца толькі адным сапраўдным лікам. Напр., даўжыня, плошча, т-ра, час, шчыльнасць, работа. Значэнне С. можна адлюстраваць пунктам на лінейнай шкале (гл. *Вось* у матэматыцы).

СКАЛЯ́РНАЕ ПО́ЛЕ, вобласць прасторы, з кожным пунктам якой звязаны некаторы *скаляр*. Матэматычна вызначаецца скалярнай функцыяй $\varphi(M)$, залежнай ад каардынат пераменнага пункта M дадзенай вобласці. Напр., поле т-р унутры дадзенага цела, поле шчыльнасцей. Асн. характарыстыка С.п. — *градыент*; матэм. апарат вывучэння С.п. — *вектарнае злічэнне*. С.п. ў фізіцы — *поле фізічнае*, якое апісваецца скалярнай функцыяй, інварыянтнай адносна павароту восей каардынат. Адрозніваюць уласна С.п. (знак функцыі поля не мяняецца пры прасторавай інверсіі) і псеўдаскалярнае поле (калі знак мяняецца). У квантавай тэорыі поля квантамі С.п. з'яўляюцца часціцы з нулявым спінам.

СКАЛЯ́РНЫ ЗДАБЫ́ТАК вектараў a і b, лік (*скаляр*), роўны здабытку модуляў гэтых вектараў, памножанаму на косінус вугла паміж імі. С.з. $\vec{a}\vec{b} = \vec{a}\cdot\vec{b} = (\vec{a},\vec{b}) = |\vec{a}|\,|\vec{b}|\cos\varphi$, дзе $|\vec{a}|$ і $|\vec{b}|$ — модулі вектараў $\vec{a}$ і $\vec{b}$, φ — вугал паміж імі. Напр., работа A пастаяннай сілы $\vec{F}$ пры перамяшчэнні $\vec{S}$ пункта яе прыкладання роўная $A = \vec{F}\cdot\vec{S}$. Паняцце С.з. абагульняецца на n-мерныя вектарныя прасторы, дзе з яго дапамогай вызначаюць паняцці модуля вектара, вугла паміж вектарамі, артаганальнасці і інш. С.з. уведзены У. Гамільтанам (1853). Выкарыстоўваецца ў геаметрыі, механіцы і фізіцы.

СКАЛЯ́РНЫ ПАТЭНЦЫЯ́Л, энергетычная характарыстыка *электрастатычнага поля*; гл. ў арт. *Патэнцыял* у фізіцы.

СКАМАРО́ХІ, народныя акцёры, вядомыя ўсх.-слав. народам са старажытнасці да пач. 20 ст. Першыя прафес. акцёры, дзейнасць якіх грунтавалася на нар. творчасці, выступалі як музыкі, спевакі, выканаўцы сцэнак, дрэсіроўшчыкі, акрабаты, фокуснікі, лялечнікі і інш. на плошчах гарадоў, мястэчак, вёсак, у замках, корчмах. Тэрмін «С.» паявіўся ва ўсх. славян у балг. перакладах з грэч. мовы ў 8—9 ст. Першае летапіснае ўпамінанне ў 1068, выява прадстаўлення С. — на фрэсках Сафійскага сабора ў Кіеве (1039). На Беларусі першае ўпамінанне тэрміна «С.» ў пропаведзях Кірылы Тураўскага, а выявы зафіксаваны ў археал. знаходках 12 ст. з Навагрудка (вухавёртка з выявай музыкі) і Ваўкавыска (шахматная фігурка ў выглядзе барабаншчыка). Захаваліся выявы С. у Аршанскім (13 ст.) і Мсціжскім (14 ст.) евангеллях, на мініяцюрах Радзівілаўскага летапісу 15 ст. Вядомы С. аселыя і вандроўныя. Аселыя жылі ў гарадах і мястэчках, часта мелі зямельныя надзелы і былі цесна звязаны з пэўнай гульнёвай нар. традыцыяй, удзельнічалі ў каляндарных і сямейных святах і абрадах, спрыялі развіццю тэатральна-гульнёвага пачатку. Вандроўныя С. не былі звязаны з якой-небудзь рэгіянальнай маст. традыцыяй. На Беларусі вядомы С.-музыкі, бахары (казачнікі, апавядальнікі баек і інш.), штукары (гімнасты, ілюзіяністы), мядзведнікі, лялечнікі і інш. Існавалі спец. вучэльні-школы, у т.л. *Смаргонская акадэмія*. У параўнанні з Маскоўскай дзяржавай, дзе С. зазналі ўціск з боку царк. і свецкіх улад і нават забарону дзейнасці (1648 і 1657), на Беларусі яны мелі адносна больш спрыяльныя ўмовы для свайго мастацтва і праіснавалі да пач. 20 ст. Апошні паказ С. «Велікодныя яйкі» зафіксаваны ў 1925 у в. Астроўна Віцебскай вобл. С. ўзбагачалі і плённа развівалі нар. тэатральнае мастацтва. Традыцыі мастацтва С. выразна адчуваюцца ў разнастайных формах нар. гульнёвай культуры.

Да арт. **Скамарохі**. Музыка іграе на псалтыры. Наверша вухавёрткі з раскопак у Навагрудку. 12 ст.

Літ.: Барщевский И. Несколько слов из истории искусства скоморохов. Ростов-Ярославский, 1914; Белкин А.А. Русские скоморохи. М., 1975; Каладзінскі М. Скамарохі // Гісторыя беларускага тэатра. Мн., 1983. Т. 1.

Да арт. **Скамарохі**. Прадстаўленне скамарохамі русалі. Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу. 15 ст.

СКАНДРАКО́Ў Сяргей Вячаслававіч (21.10.1876, г. Мглін Бранскай вобл., Расія — 2.8.1953), бел. вучоны, журналіст. Вучыўся ў Слуцкай і Мінскай гімназіях, скончыў Маскоўскі с.-г. ін-т (1906). Удзельнічаў у рабоце *Мінскага таварыства аматараў прыгожых мастацтваў*. У рэвалюцыю 1905—07 чл. Мінскага к-та Бел. сацыяліст. грамады, рэдактар-выдавец газ. «Голос Белоруссии» (выйшаў 1 нумар 1.1.1906 у Мінску, забаронена царскімі ўладамі), дзе змясціў свой рэв. твор «Казка пра голых і сабаліныя футры», вершы на бел. мове Ф.Багушэвіча і Я.Лучыны. Адзін з заснавальнікаў кніжнага т-ва *«Мінчук»*. У 1907—10 у мінскіх газетах друкаваў паліт. казкі. З 1911 дырэктар доследнага поля ў Палтаўскай губ., з 1921 — Бел. аграномічнай станцыі ў Банцараўшчыне, праф. БДУ, БСГА. Працаваў у Інбелкульце (у 1923—25 адказны сакратар Цэнтр. бюро краязнаўства) і Бел. НДІ сельскай і лясной гаспадаркі. З 1931 на навук. і пед. рабоце ў Яраслаўлі, Мічурынску, Душанбе, Алма-Аце, Карагандзе. Аўтар апавяд. «Аграном Сэрадэля» (1924), навук.-папулярных нарысаў па аграноміі, артыкулаў па краязнаўстве. С. — прататып Кандаковіча ў трылогіі Я.Коласа «На ростанях». Збярог жывапісныя творы К.Каганца «Тып беларуса» і «Зімовы пейзаж». Перапісваўся з У.Караленкам.



С.В.Скандракоў.

Літ.: Скалабан В. Па слядах Сяргея Мглінскага // Мастацтва Беларусі. 1986. №11.

В.У.Скалабан.

СКА́НДЫЙ (*лац. Scandium*), *Sc*, хімічны элемент *III* групы перыяд. сістэмы, ат. н. 21, ат. м. 44,95591, адносіцца да *рэдказямельных элементаў*. У прыродзе адзін стабільны нуклід ^{45}Sc. У зямной кары $1 \cdot 10^{-3}$% па масе. Існаванне С. прадказана Дз.І.Мендзялеевым у 1870; адкрыты ў 1879 швед. хімікам Л.Нільсанам, назва ад лац. Scandi(navia) па месцы адкрыцця.

Мяккі серабрысты метал з жоўтым адценнем, шчыльн. 3020 кг/м^3, $t_{пл}$ 1541 °С, $t_{кіп}$ 2837 °С. Слабы парамагнетык. У паветры пакрываецца ахоўнай плёнкай сесквіаксіду Sc_2O_3. Пры 200 °С акісляецца кіслародам. Узаемадзейнічае з растворамі салянай, сернай, азотнай кіслот, пры награванні з вадародам, азотам (утварае нітрыд ScN), галагенамі (трыгалагеніды). З металамі ўтварае цвёрдыя растворы і інтэрметаліды. Атрымліваюць аднаўленнем трыфтарыду ScF_3 ці трыхларыду $ScCl_3$ метал. кальцыем з наступнай перагонкай металу ў высокім вакууме. Выкарыстоўваюць С. як кампанент лёгкіх сплаваў з высокай трываласцю і каразійнай устойлівасцю, як гетэр, нейтронны фільтр у ядз. тэхніцы, Sc_2O_3 у вытв-сці фарытаў для элементаў памяці ЭВМ, штучных гранатаў, цвёрдых электралітаў (разам з дыаксідам цырконію) і інш.

СКАНДЫНАВІ́ЗМ, плынь грамадскай думкі ў скандынаўскіх краінах (Данія, Нарвегія, Швецыя), якая з 19 ст. культывуе ідэі іх дзярж., паліт., эканам. і культ. аб'яднання. Узнік у 1820—30-я г. ў Даніі, пашырыўся з 1840—60-х г. (у сувязі з пруска-дацкімі войнамі 1848—50 і 1864), у т.л. ў Швецыі. Сярод прыхільнікаў ідэй С. — швед. каралеўская дынастыя *Бернадотаў* (кароль Карл XV і інш.). У 20 ст. ідэі міждзярж. інтэграцыі краін Скандынавіі набылі практычнае ўвасабленне ў *Паўночным савеце* (засн. ў 1952).

СКАНДЫНА́ЎСКІ ПАЎВО́СТРАЎ. Самы вялікі ў Еўропе, на ПнЗ мацерыка. Даўж. каля 1900 км, шыр. да 800 км, пл. каля 800 тыс. км^2. Абмываецца Баранцавым, Нарвежскім, Паўн., Балт. морамі, іх залівамі і пралівамі. Зах. і паўн. берагі высокія, стромкія, фіёрдавага тыпу, усх. і паўд. — нізкія, пераважна скалістыя, шхернага тыпу, на асобных участках плоскія, пясчаныя; моцна парэзаныя. Уздоўж узбярэжжаў — шматлікія астравы і скалы. Зах. і цэнтр. часткі паўвострава займаюць *Скандынаўскія горы* (г. Гальхёпіген, 2469 м), усх. схілы якіх пераходзяць у плато Норланд выш. 400—700 м. Уздоўж Балт. м. размешчана Сярэдняшведская нізіна з вял. азёрамі, марэннымі і озавымі падняццямі; на Пд — купалападобнае ўзв. Смоланд (выш. да 377 м), прыморскія нізіны. У геал. адносінах С.п. належыць да *Балтыйскага шчыта* і зоны *каледонскай складкавасці*. У плейстацэне С.п. быў цэнтрам зледзянення Еўропы. Захаваліся шматлікія марэнныя грады, друмліны, озы і інш. формы ледавіковага рэльефу, у высакагор'ях — ледавікі. Карысныя выкапні: жал., малібдэнавыя, тытанавыя, медныя, уранавыя, марганцавыя руды, поліметалы. Клімат С.п. пераважна ўмераны, на Пн — субарктычны; на яго ўздзейнічае Паўн.-Атл. цёплае цячэнне. На З клімат умераны марскі з мяккай зімой (сярэдняя т-ра студз. ад -4 °С да 2 °С на Пд) і халаднаватым летам (ад 10 °С на Пн да 14 °С на Пд), вялікай вільготнасцю (1000—3000 мм за год). На У клімат пераходны да кантынентальнага. Зіма марозная (-15 °С на Пн, -5 °С на Пд), лета ўмерана цёплае (да 17 °С у ліп. на Пд). Ападкаў ад 400 да 800 мм за год. Рачная сетка С.п. густая. Рэкі кароткія, з парогамі і вадаспадамі, багатыя гідраэнергет. рэсурсамі; найб. буйныя — Глома, Торніяёкі, Далельвен, Онгерманельвен, Кларэльвен. Шматлікія азёры тэктанічнага, ледавіковага і змешанага паходжання: Венерн, Ветэрн, Меларэн, Ельмарэн. У раслінным покрыве пераважаюць хваёвыя лясы. На крайняй Пн — зона тундраў; Пд паўвострава — у зоне мяшаных лясоў (пераважае бук). На зах. узбярэжжы і схілах верасоўнікі і тарфянікі. У гарах вышынная пояснасць: хваёвыя лясы падымаюцца да 400 м на Пн і 900 м на Пд, ад 900 да 1100 м — пояс бярозавага крывалесся, вышэй — горная тундра. Жывёльны свет прадстаўлены тундравымі і ляснымі формамі. На ўзбярэжжах — птушыныя базары, прыбярэжныя воды багатыя рыбай. На С.п. размешчаны Швецыя, Нарвегія, паўн.-зах. ч. Фінляндыі. Буйныя гарады: Стакгольм, Гётэбарг (Швецыя), Осла (Нарвегія). *М.В.Лаўрыновіч.*

СКАНДЫНА́ЎСКІЯ ГО́РЫ, Скандынаўскае нагор'е. На Скандынаўскім п-ве, у Швецыі і Нарвегіі. Даўж. каля 1700 км, шыр. ад 200—300 км на Пн да 600 км на Пд, выш. да 2469 м (г. Гальхёпіген). Стромка абрываюцца да ўзбярэжжа Нарвежскага м., пакатымі ўступамі спускаюцца да Батнічнага зал., утвараючы пласкагор'е Норланд. Складзены з крышт. і метамарфічных парод, якія змяты ў складкі ў каледонскую эпоху; на У злучаюцца з Балт. шчытом. Пасля доўгай дэнудацыі горы перанеслі паўторнае падняцце ў кайназоі, якое ўтварыла сістэму блокаў, трэшчын і разломаў. Найб. амплітуды падняцці дасягнулі ў цэнтр. і зах. частках С.г., што вызначыла зрушанасць водападзельных хрыбтоў на З. і значную шыр. ўсх. схілаў. У чацвярцічны час С.г. траплялі пад покрыўнае зледзяненне, з чым звязана шырокае развіццё ледавіковых адкладаў і форм рэльефу. С.г. ўяўляюць сабой рад выцягнутых з ПнУ на ПдЗ горных плато, якія расчлянёны тэктанічнымі далінамі на асобныя масівы. Вяршынныя паверхні — фіельды, серыя паднятых на выш. больш за 2000 м пенепленаў. Найб. высокія пласкагор'і ў паўд. ч. С.г. — Ютунхеймен, Хардангервіда, Юстэдалсбрэ, Тэлемарк, Доўрэфіель. Над сярэднім узр. пласкагор'яў (ад 900 да 1700 м) узвышаюцца асобныя групы вяршынь і хрыбтоў з альпійскімі формамі рэльефу. У сярэдняй ч. С.г. прыкметна зніжаюцца. Іх перасякае Емтландская зона тэктанічных апусканняў — прадаўжэнне глыбока ўрэзанага ў сушу Тронхеймс-фіёрда. На Пн распасціраецца хр. Х'елен, перасечаны папярочнымі і падоўжнымі далінамі, над якімі ўздымаюцца завостраныя вяршыні з ка́равымі і далінными ледавікамі на схілах (г. Кебнекайсе, 2123 м). Крайняя Пн — пласкагор'е Фінмаркен (300—500 м) з асобнымі астанцовымі вяршынямі. На З С.г. амаль ушчыльную падыходзяць да ўзбярэжжа і моцна расчлянёныя. Вял. колькасць фіёрдаў: самы доўгі ў Еўропе — Согнефіёрд (даўж. 220 км, шыр. 5—6 км), Хардангер-фіёрд, Букн-фіёрд і інш. З боку мора фіёрдавае ўзбярэжжа акаймавана вузкай (30—60 км) паласой прыбярэжнай раўніны, утворанай у выніку маладых тэктанічных падняццяў (выш. да 40 м), дзе сканцэнтравана значная частка нас. пунктаў, гандл. і рыбалавецкіх партоў Нарвегіі. Карысныя выкапні: жал., медна-нікелевыя, сульфідныя, тытанавыя руды. Клімат умераны, пераважна акіянічны з халаднаватым летам, умерана халодная зімой. Пад уплывам цёплага Паўн.-Атлантычнага цячэння сярэдняя т-ра студз. адносна высокая для гэтых шырот і зменьваецца ад 1 °С да -14 °С, сярэдняя т-ра ліп. ад 16 °С да 6 °С. Ападкаў на зах. схілах да 3000 мм, на ўсх. — 400—800 мм за год. Клімат фіельдаў характарызуецца нізкімі т-рамі зімовых і летніх месяцаў, што разам з вялізнай вільготнасцю вызначае развіццё сучаснага зледзянення. Снегавая лінія ляжыць на выш. 700—800 м на Пн, 1500—1700 м на Пд. На З яна ніжэйшая, чым на У. Агульная плошча зледзянення С.г. каля 5 тыс. км^2. Найб. ледавікі Юстэдалсбрэ, Фольгефані. Густая сетка мнагаводных, парожыстых рэк, шматлікія азёры тэктанічна-ледавіковага паходжання. С.г. ўкрыты горнатаежнымі лясамі (хвоя, елка), асабліва на ўсх. схілах. Лясы падымаюцца да выш. 300—500 м на Пн і 900 — 1100 м на Пд. Вышэй паласа бярозавага крывалесся. Фіельды бязлесныя, пераважае горна-тундравая хмызняковая і мохавалішайнікавая расліннасць, якая месцамі чаргуецца з лугамі. Па рачных далінах — нізкаствольія бярэзнікі. На зах. схілах фармацыі верасоўнікаў і тарфянікаў. На Пд — мяшаныя і шыракалістыя лясы. *М.В.Лаўрыновіч.*

СКАНДЫНА́ЎСКІЯ МО́ВЫ, паўночная (нардычная) падгрупа *германскіх моў*. Да С.м. належаць: *дацкая мова*, *шведская мова*, *нарвежская мова*, *ісландская мова* і фарэрская. Пашыраны на тэр. Даніі (у т.л. Фарэрскіх а-вах), Швецыі, Нарвегіі, Ісландыі, зах. часткі Фінляндыі.

Перыяд праскандынаўскага (агульнаскандынаўскага, пранардычнага) адзінства (пасля адасаблення ад готаў) — I—7 ст. н.э. вядомы па рунічных надпісах 3 ст. (гл. *Рунічнае пісьмо*). У выніку экспансіі скандынаваў на З, Пд і У пераважна ў 9—10 ст. адбылася паступовая дыялектная дыферэнцыяцыя, вынікам якой стала ўзнікненне моў усх.-скандынаўскіх (шведская і дацкая) і зах.-скандынаўскіх (нарвежская, ісландская, фарэрская). С.м. дастаткова дыферэнцыраваныя ў фаналагіч-

ных і марфал. адносінах, значна меней у сінтаксічных. У лексіцы найб. адрозненні назіраюцца паміж астраўнымі і кантынентальнымі мовамі.

Літ.: Вессен Э. Скандинавские языки: Пер. со швед. М., 1949; Стеблин-Каменский М.И. История скандинавских языков. М.; Л., 1953; Скандинавские языки: Актуальные пробл. грамматич. теории. М., 1984.

А.Я.Міхневіч.

Скандэрбег.

СКАНДЭРБЕ́Г [Scanderbeg, Skënderbeu; сапр. Кастрыёці (Kastrioti) Георг, каля 1405—17.1.1468], кіраўнік вызв. барацьбы алб. народа супраць асманскіх заваёўнікаў, нац. герой Албаніі. Паходзіў з княжацкага роду Кастрыёці. У дзіцячым узросце ўзяты заложнікам да тур. султана Мурада II. Служыў у тур. арміі, удзельнічаў у многіх войнах, выявіў ваен. здольнасці. За ваен. заслугі атрымаў тытул бея і ў гонар Аляксандра Македонскага названы Іскандэрам (адсюль С. — скажонае Іскандэр-бей). Спакваля рыхтаваўся да барацьбы супраць тур. султана, кантактаваў з яго ўнутр. і знешнімі праціўнікамі, вёў перагаворы з *Я.Хуньядзі*. Пасля пераможнай для венг. арміі бітвы з тур. войскамі каля Ніша (3.11.1443) С. з атрадам у 300 вершнікаў пакінуў тур. лагер і прыбыў у Дыбру. Абапіраючыся на свабодных сялян, пачаў паход, накіраваны на выгнанне турак з алб. зямель. Неўзабаве ён заняў Крую, 28 ліст. абвешчаны галавой княства Кастрыёці. Выгнаў тур. гарнізоны з шэрагу крэпасцей і ўсталяваў незалежную ад туркаў уладу на частцы тэр. краіны. У 1444 засн. лігу алб. князёў і стаў яе кіраўніком, стварыў і ўзначаліў рэгулярную армію. На працягу 24 гадоў адбіваў спробы тур. захопнікаў аднавіць сваю ўладу на алб. землях (разгром тур. арміі ў 1444, 1457, абарона Круі ў 1450, 1466 — 67). У Албаніі ўстаноўлены ордэн С., яго імем названа гал. плошча ў Тыране, дзе яму ўстаноўлены помнік. На Беларусі імя С. вядома з помніка перакладной л-ры пач. 17 ст. — *«Аповесць пра Скандэрбега»*.

СКА́НЕР (англ. scanner разгортвальная прылада), электронная прылада, якая пераўтварае плоскі відарыс (тэкст, табліцу, чарцёж, фатаграфію ці інш.) у ліччбавы код шляхам паслядоўнага прагляду (*сканіравання*) усіх пунктаў поля відарыса. Пры гэтым для кожнага пункта вымяраюцца яго яркасныя і колерныя характарыстыкі. Выкарыстоўваецца для ўводу інфармацыі ў ЭВМ або для перадачы яе па лініях факсімільнай сувязі.

СКАНІ́РАВАННЕ (ад англ. scan разгортваць; праглядаць) у медыцыне, метад даследавання асаблівасцей анат. будовы і размяшчэння ўнутр. органаў, шкілета, выяўлення пухлін (іх метастазаў) і інш. Адрозніваюць радыеізатопнае С. (шляхам графічнай рэгістрацыі размеркавання ў арганізме радыефармацэўтычнага прэпарата з дапамогай аўтам. рэгістравальных прылад — сканераў, якія ажыццяўляюць парадковае перамяшчэнне дэтэктара над ч. цела, што даследуецца) і ультрагукавое (з выкарыстаннем ультрагуку). Пры радыеізатопным С. выпрамяненне радыеізатопаў рэгіструецца і пераўтвараецца спец. электронным прыстасаваннем у штрыхавыя адзнакі на паперы (утвараецца чорна-белая або каляровая сканаграма). Пры аналізе сканаграм выяўляюць ачагі (участкі) залішняга або недастатковага назапашвання прэпарата, якія характарызуюць павышаную або паніжаную функцыян. актыўнасць органа, тканкі.

І.М.Семяненя.

СКАНІ́РАВАННЕ ў тэхніцы, кіравальнае прасторавае перамяшчэнне (паводле пэўнага закону) светлавога пучка, пучка электронаў, напрамку максімуму выпрамянення (прыёму) антэны і інш., пры якім паслядоўна «праглядаецца» зададзеная зона прасторы ці паверхні назіранага аб'екта.

Ажыццяўляецца мех. (напр., вуглавым перамяшчэннем выпрамяняльнай сістэмы) ці немех. метадамі — эл. кіраваннем элементамі выпрамяняльніка ці ўласцівасцямі асяроддзя, дзе распаўсюджваецца прамень (пучок). С. пучка зараджаных часціц выконваецца ўздзеяннем на яго пераменным эл. або магн. полем. С. плоскіх відарысаў (тэксту, чарцяжоў, рысункаў і інш.) выконваецца з дапамогай *сканера*. Выкарыстоўваецца ў электронна-прамянёвых прыладах, растравых мікраскопах, сістэмах аптычнай апрацоўкі інфармацыі, радыёлакацыі і інш.

Грузавы аўтамабіль «Сканія»: мадэль Р93МА-4×2 са смеццезбіральным кузавам.

«СКА́НІЯ» (Scania), сям'я грузавых аўтамабіляў вял. грузападымальнасці і аўтобусаў. Выпускаецца з 1911 швед. фірмай «Сканія-Вабіс» (з 1968 «САА Б-Сканія» — аўтамаб. аддзяленне авіяцыйнага канцэрна «САА Б»). Грузавыя аўтамабілі рознага прызначэння маюць поўную масу 17,5 — 47 т (аўтапаязды да 60 т), рухавікі магутнасцю 155 — 368 кВт. Аўтобусы — пасажыраўмяшчальнасць 27 — 150 чал.

СКА́НСЭН (швед. Skansen), этнаграфічны музей пад адкрытым небам, дзе экспануюцца ўзоры нар. архітэктуры і прылад працы пэўнага рэгіёна. У экспазіцыю ўваходзяць помнікі нар. дойлідства (як правіла, драўляныя), перавезеныя з розных рэгіёнаў краіны і абсталяваныя этнагр. начыннем (прадметы побыту, вырабы нар. рамёстваў і промыслаў і г.д.). У натуральным асяроддзі яны ўтвараюць цэласны сядзібна-бытавы і культ.-грамадскі комплекс, фрагмент традыц. вёскі, мястэчка, гар. вуліцы і інш. Узніклі С. ў 19 ст. ў Еўропе. Ідэю такога музея ўпершыню сфармуляваў швейц. пісьменнік Ч. Бастэтэн. Развіццю ідэі спрыяла стварэнне этнагр. аддзелаў у музеях Берлінскім Новым (1855), Амер. прыродазнаўча-гіст. (1866), Брыт. (1860-я г.) і інш. У 1867 на Маскоўскай этнагр. выстаўцы, прымеркаванай да I слав. з'езда, экспанаваліся макеты сядзіб і жытла з рэгіёнаў Расіі, Беларусі, Украіны. Макеты помнікаў нар. архітэктуры экспанаваліся таксама на сусв. выстаўцы ў Парыжы (1867) і Вене (1873). У 1874—86 стваральнік буйнейшага ў Еўропе заал. парку каля г. Гамбург (Германія) К. Гагенбек арганізаваў антрапазаал. экспазіцыі ў еўрап. сталіцах калмыкаў, індзейцаў, эскімосаў, лапландцаў і інш., якія дэманстравалі свае жытлы, прадметы працы і побыту, стваральнасць часовыя музеі пад адкрытым небам. У канцы 19 ст. на этнагр. выстаўках пачалі экспанаваць перавезеныя і адрэстаўрыраваныя сядзібы і двары (1894, краёвая выстаўка ў г. Львоў, Украіна; 1895, Прага). На выстаўцы ў Будапешце (1896) экспанавалася вёска з 24 сядзіб. Як форма музейнай дзейнасці з перавозкай помнікаў атрымала развіццё ў краінах Скандынавіі. У 1873 лінгвіст і этнограф А.Хецэліус стварыў у Стакгольме сканд. этнагр. калекцыю, у 1880 на яе аснове — Паўн. музей з помнікамі драўлянага дойлідства, які размясціўся на в-ве Дзюгардэн у прадмесці Стакгольма Скансэн (адсюль назва), у 1891 адкрылася экспазіцыя першага ў свеце музея пад адкрытым небам. У пач. 20 ст. С. адкрыты ў Осла (Бігдой, 14 га, больш за 100 помнікаў), Орхусе (Данія, больш за 50 помнікаў), Арнеме (Галандыя, пл. 33 га, 19 тыпаў сельскіх дамоў) і інш. Іх структуру ўтваралі жылыя і гасп. пабудовы, аб'яднаныя ў сядзібы, а сядзібы — у фрагменты паселішчаў, а таксама — сакральныя збудаванні, будынкі заезных дамоў, ратушы, школы, крамы, майстэрні рамеснікаў, вытв. будынкі (кузні, млыны і інш.). Важная роля адводзілася ландшафту. Сярод найб. маляўнічых С.: Кашубскі каля г. Гданьск (Польшча; 1906, пл. 12 га, 37 помнікаў), у *Каломенскім* (Масква; 1923), г. Рожнаў (Чэхія; 1925), музей-сяло каля Бухарэста (1936, пл. 62 га, больш за 220 помнікаў), музей-вёска ў г. Сан-Дыега (ЗША; 1946), у Букрыку каля Бруселя (1954, пл. 54

га, 61 помнік), Эстонскі парк-музей нар. дойлідства і побыту ў Таліне («Рок аль Марэ»; 1957, пл. 60 га), комплекс «Этыр» каля г. Габрава (Балгарыя; 1961, пл. 6 га), у Румшышкесе (Літва; 1966, пл. 175 га, больш за 100 помнікаў) і інш. У 1969 у Расіі адкрыты музей-запаведнік нар. драўлянага дойлідства і этнаграфіі Карэліі пад адкрытым небам на в-ве *Кіжы* (28 помнікаў). Усяго існуе больш за 600 нац. музеяў-С. і некалькі тысяч занальных, рэгіянальных, лакальных, мемар. і музеяў-помнікаў пад адкрытым небам. Іх экспазіцыі будуюцца паводле выпрацаваных прынцыпаў: этнагр. (адлюстраванне культуры і побыту гіст.-этнагр. рэгіёнаў і лакальных раёнаў краіны), гіст. (эвалюцыя культуры ў часе), сац. (культура грамадскіх саслоўяў), функцыян. (супадпарадкаванне пабудоў у двары, сядзібе, паселішчы). Перавага аддаецца захаванню помнікаў нар. дойлідства на гіст. месцах, у жывым асяроддзі і стварэнне на іх аснове ландшафтных запаведнікаў, арх.-этнагр. запаведнікаў, музеяў-ферм, музеяў-вёсак, музеяў-прадмесцяў, гіст. гарадоў і інш. У 1976 засн. *Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту* (на беразе Воўчкавіцкага вадасховішча, пл. каля 210 га).

Літ.: Шмелев В.Г. Музеи под открытым небом. Киев, 1983; Локотко А. Белорусскому скансену 20 лет // Архитектура и стр-во. 1996. №5/6. *А.І.Лакотка.*

СКАНЬ, тое, што *філіграń*.

СКАПА́ (Pandion haliaëtus), драпежная птушка сям. скапіных атр. сокалападобных. Адзіны від сямейства. Пашырана ў Еўразіі, Паўн. Амерыцы, Паўн. Афрыцы, Аўстраліі. Жыве ў азёрна-лясных ландшафтах. На Беларусі пералётны від; гняздуецца пераважна на Пн рэспублікі ў Беларускім Паазер'і. Занесена ў Чырв. кнігу.

Даўж. цела 60 см, крыла 50 см, маса да 1,9 кг. Самкі буйнейшыя за самцоў. Апярэнне зверху цёмна-бурае, знізу жаўтавата-белае, з падоўжнымі бурымі стракацінамі на грудзях. На патыліцы чубок з завостраных пёраў. Дзюба і кіпцюры чорныя, васкавіца і лапы шэрыя. Корміцца пераважна рыбай. Адкладвае да 4 яец. *Э.Р.Самусенка.*

СКАПАЛІ́Т (ад грэч. skapos слуп + lithos камень), група мінералаў, каркасных алюмасілікатаў, $(Na, Ca, K)_4 [Al_3 (Al, Si)_3 Si_6 O_{24}] (Cl, CO_3, SO_4, F, OH)$. Мінералы гэтай групы ўтвараюць бесперарыўны ізаморфны рад ад марыяліту $Na_4 [Al_3 Si_9 O_{24}]Cl$ да меяніту $Ca_4 [Al_6 Si_6 O_{24}] \cdot CO_3$. Маюць прымесі жалеза, магнію, тытану, марганцу. Крышталізуюцца ў тэтраганальнай сінганіі. Утвараюць слупкаватыя крышталі, зярністыя і паралельна-шаставатыя агрэгаты і інш. Колер белы, шэры, шэра-зялёны, мядова-жоўты, ружовы, блакітны да фіялетавага. Празрыстыя і паўпразрыстыя. Бляск шкляны. Цв. 6. Шчыльн. 2,6 — 2,75 г/см^3. Паходжанне метамарфічнае. Пародаўтваральныя мінералы. Буйныя празрыстыя крышталі выкарыстоўваюцца ў ювелірнай справе. Радовішчы ў Расіі, Танзаніі і інш.

Скапаліт.

СКАПА́НІЯ (Scapania), род пячоначных імхоў сям. скапаніевых. Каля 50 відаў. Пашыраны пераважна ў Паўн. паўшар'і. На Беларусі 5 відаў С.: балаталюбная (S. paludicola), дуброўная (S. nemorosa), завостраная (S. apiculata), занесеная ў Чырв. кнігу; заліўная (S. irrigua), кароткая (S. curta). Трапляюцца на вільготнай глініста-пясчанай і тарфяной глебе.

Двух-, часам аднадомныя лістасцябловыя расліны выш. да 10 см, утвараюць дзярнінкі.

Скапанія: 1 — завостраная; 2 — хвалістая.

СКАПЦЫ Сцёблы ляжачыя або прыўзнятыя, разгалінаваныя. Лісце кіляватае, двухлопасцевае, шчыльна размешчанае па сцябле. *Архегоніі* на верхавінцы сцябла, *антэрыдыі* па некалькі ў пазухах покрыўнага ліста. Каробачка прадаўгавата-акруглая.

СКАПАФІЛІ́Я, адзін з відаў палавой ненармальнасці, тое, што *вуаерызм*.

СКАПІ́Н-ШУ́ЙСКІ Міхаіл Васілевіч (18.11.1586 — 3.5.1610), рускі дзярж. і ваен. дзеяч, князь. У 1604 стольнік пры цару *Барысе Гадунове*. З прыходам да ўлады свайго сваяка *Васіля Іванавіча Шуйскага* ў 1606 прызначаны ваяводаю. Удзельнік задушэння *Балотнікава паўстання 1606—07*. У 1608 вёў перагаворы са шведамі аб саюзе супраць Ілжэдзмітрыя II, які аблажыў Маскву. У 1609—10 на чале рус.-швед. войска атрымаў шэраг перамог над войскам Ілжэдзмітрыя II, зняў аблогу Масквы і пераможцам увайшоў у сталіцу.

...СКАПІЯ (ад грэч. skopeō назіраю, разглядваю), другая састаўная частка складаных слоў, якая паказвае на адносіны да назірання, візуальнага даследавання чаго-н. (напр., рэнтгенаскапія, эндаскапія).

СКАПЦЫ́, адна са старых рускіх сектаў, якая вылучылася з хрыставер'я (*хлыстоў*). У 1760—70-я г. пашырылася сярод аброчных сялян у шэрагу цэнтр. губерняў Расіі. Заснавальнікам і найб. аўтарытэтам С. лічыўся К.Селіванаў. Аскетызм у С. прыняў крайнюю форму: патрабаваў ад вернікаў «вогненнага хрышчэння» — кастрацыі. Лічылася, што менавіта С. (са спасылкай на Евангелле, дзе ідзе размова пра С., якія самі спаклалі сябе для царства нябеснага) будуць тымі выбраннікамі, «ангелападобнымі людзьмі», якія застануцца пасля *страшнага суда*. Царскія ўлады жорстка праследавалі С., неаднаразова ссылалі. У пачатку 20 ст. налічвалася прыблізна 5—6 тыс. С. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 у Расіі абшчыны С. распаліся.

Скапа.

СКАРАБЕ́І (Scarabaeus), род жукоў сям. пласцініставусых. 5—6 відаў. Пашыраны ў Паўн. Афрыцы, Пярэдняй і Сярэдняй Азіі, на Пд Еўропы. Найб. вядомы С. свяшчэнны (S. sacer).

Даўж. 20—40 мм. Цела шырокае, чорнае, пярэднія галёнкі і налічнік зубчастыя. Яйцы адкладваюць у грушападобныя ўтварэнні з гною, якія закопваюць у глебу (у іх развіваюцца лічынкі). Кормяцца гноем, з якога папярэдне робяць шарыкі. С. свяшчэнны даўж. 21—37 мм, выявы якога былі ў Стараж. Егіпце прадметамі культу. Іл. гл. да арт. *Гнаевікі.*

СКАРАДЗІ́Т (ад грэч. skorodon часнок; ад часночнага паху, што ўзнікае пры ўдары па мінерале), мінерал класа арсенатаў прыродных, гідрат арсеніду жалеза, $Fe\,[As\,O_4] \cdot 2H_2O$. Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі, утварае зямлістыя масы, рэдка крышталі пірамідальныя, прызматычныя, таблітчастыя. Колер шаравата-зялёны, зеленавата-буры. Цв. 3,5—4. Шчыльн. 3,3 г/см^3. Крохкі. Паходжанне гіпергеннае. Трапляецца ў жалезных шапках, у зонах акіслення рудных радовішчаў, вакол некат. тэрмальных крыніц у Аўстраліі, Францыі, Грэцыі, Вялікабрытаніі, Намібіі, Бразіліі.

Г.Скарадумаў. Партрэт І.І. Скарадумава. Пач. 1790-х г.

СКАРАДУ́МАЎ Гаўрыла Іванавіч (23.3.1755, С.-Пецярбург — 23.7.1792), рускі гравёр і мініяцюрыст. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1764—73). У 1773—82 пенсіянер АМ у Лондане, дзе працаваў пад кіраўніцтвам Ф.Барталоцы, пазней самастойна. Пачынальнік у Расіі гравюры каляровай, а таксама выканаў у пункцірнай манеры. Гравюры вызначаюцца вытанчанасцю тэхн. прыёмаў, часам падобныя да малюнкаў сангінай або бістрам (партрэты І.І.Скарадумава, пач. 1790-х г.; К.Р.Дашкавай, 1777). Аўтар партрэтных мініяцюрных акварэляў, малюнкаў пяром.

Літ.: Некрасова Е.А. Г.И. Скородумов. М., 1954.

СКАРАПА́ДСКІ Іван Ільіч (1645, г. Умань Чаркаскай вобл., Украіна — 14.7.1722), украінскі дзярж. дзеяч. З 1674 на *Левабярэжнай Украіне*, у часы гетманства І.С.*Мазепы* (1687—1708) быў генеральным бунчужным з 1698, генеральным есаулам з 1701, старадубскім палкоўнікам (1706—08). У *Паўночную вайну 1700—21*, калі Мазепа з часткай укр. *старшыны казацкай* перайшоў на бок шведаў (1708), С. захаваў вернасць Расіі і на старшынскай нарадзе ў г. Глухаў (17.11.1708) паводле рэкамендацыі цара *Пятра I* выбраны гетманам Левабярэжнай Украіны (1708—22). Удзельнік *Палтаўскай бітвы 1709.* Найбуйнейшы землеўладальнік (валодаў больш як 20 тыс. двароў); праводзіў у інтарэсах старшыны далейшае запрыгоньванне ўкр. сялян (у т.л. забараніў сялянам скардзіцца на паноў), раздаваў укр. землі рус. памешчыкам. Фактычна С. дзейнічаў пад поўным кантролем царскіх улад. Яго спробы ўзмацніць самастойнасць укр. казацкай старшыны ў кіраванні Левабярэжнай Украінай былі беспаспяховымі. Адхіліўшы пратэсты С., які бараніў *Сакавіцкія артыкулы 1654*, Пётр I 27.5.1722 стварыў *Малярасійскую калегію*, якая абмежавала ўладу гетмана.

С.Б.Каўн.

СКАРАПА́ДСКІ Павел Пятровіч (16.5.1873, г. Вісбадэн, Германія — 26.4.1945), украінскі дзярж. і паліт. дзеяч. Ген.-лейтэнант рас. арміі (1916). Паходзіў з казацкага роду нашчадкаў В.І.Скарападскага (памёр у 1727) — брата ўкр. гетмана І.І.*Скарападскага.* Скончыў Пажскі корпус у Пецярбургу (1893), служыў у коннай гвардыі. Удзельнік рус.-яп. вайны 1904—05. Флігель-ад'ютант імператара Мікалая II (1905—10). У 1-ю сусв. вайну на Паўд.-Зах. фронце, камандаваў кав. брыгадай, дывізіяй, 34-м армейскім корпусам, які ў жн. 1917 ператварыў у 1-ы ўкр. корпус. У кастр.—ліст. 1917 на чале корпуса падтрымаў укр. *Цэнтральную раду*, прызначаны кіраўніком яе ваен. фарміраванняў. У сак. 1918 ва ўмовах герм. акупацыі Украіны стварыў апазіцыйную да Цэнтр. рады «Укр. грамаду». 29.4.1918 на Усеўкр. з'ездзе хлебаробаў абвешчаны гетманам Украіны, пры падтрымцы Германіі і ч. рас. афіцэрства скінуў Цэнтр. раду і захапіў уладу. С. ўстанавіў аўтарытарную дыктатуру пераважна ў інтарэсах памешчыкаў, буржуазіі і заможнага сялянства. Пры ім адкрыты 150 укр. гімназій, 2 новыя ўкр. ун-ты (у Кіеве і Камянцы-Падольскім), Укр. акадэмія навук. Яго палітыка згодніцтва з герм. акупантамі, якія рабавалі Украіну, выклікалі масавыя выступленні рабочых і незаможных сялян, у т.л. рух пад кіраўніцтвам Н.І.*Махно.* Ва ўмовах паражэння Германіі ў 1-й сусв. вайне С. 14.12.1918 скінуты войскамі *Украінскай дырэкторыі ўрада.* Жыў у эміграцыі ў Швейцарыі і Германіі, дзе кіраваў «Укр. саюзам хлебаробаў-дзяржаўнікаў». 16.4.1945 смяротна паранены ў час адной з бамбардзіровак Германіі саюзнікамі.

Тв.: Спогади. Київ, 1995.

Літ.: Гетьман Павло Скоропадський (1873—1945): Матеріали до біобібліогр. Київ, 1996.

С.Б.Каўн.



І.І.Скарападскі.

С.Г.Скарапанаў.

СКАРАПА́НАЎ Сцяпан Гардзеевіч (7.11.1910, в. Бацвінава Чачэрскага р-на Гомельскай вобл. — 11.6.1999), бел. вучоны ў галіне агульнага земляробства і меліярацыі, дзярж. дзеяч Беларусі. Акад. АН Беларусі (1961, чл.-кар. 1950), д-р с.-г. н. (1961), прафесар (1962). Акад. УАСГНІЛ (1972). Акад. Аграрнай АН Беларусі (1992). Засл. дз. нав. Беларусі (1968). Скончыў Бел. с.-г. ін-т (1936). У 1948—50 і 1952—59 дырэктар Бел. НДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі. З 1959 акад.-сакратар Акадэміі с.-г. навук Беларусі. З 1961 міністр сельскай гаспадаркі Беларусі. У 1972—76 акад.-сакратар Зах. аддзялення УАСГНІЛ. Навук. працы па праблемах агульнага земляробства, меліярацыі і рацыянальным выкарыстанні тарфяна-балотных глеб, аховы навакольнага асяроддзя, таксама па пытаннях лугаводства, глебазнаўства і аграхіміі.

Тв.: Осушение и сельскохозяйственное освоение болот в Белоруссии. 2 изд. М., 1955 (разам з А.Ф.Печкуровым, Б.Б.Бельскім); Освоение и использование торфяно-болотных почв. Мн., 1961; Мелиорация земель и охрана окружающей среды. Мн., 1982 (разам з У.П.Карлоўскім, У.С.Бразгуновым); Земельная реформа и ее последствия. Мн., 1995.

Літ.: Библиография научных трудов академика С.Г.Скоропанова. Мн., 1995.

СКАРАСПЕ́ЛАСЦЬ раслін і жывёл, здольнасць да хуткага росту і развіцця. Вызначаецца раннім дасягненнем стану спеласці, у раслін — біял. і гасп., у жывёл — фізіял. палавой, гасп. і інш. З'яўляецца спадчыннай прыкметай, уласцівай пэўным культурам (салата, радыс, шпінат), сартам (аўса — Эрбграф; грэчкі — Чарнаплодная, Аніта Беларуская; бульбы — Беларуская ранняя, Дзецкасельская, Прыгожая-2, Адрэта, Дабро; капусты — Скараспелка-3, цыбулі — Янтарная, Стрыгуноўская мясцовая; агуркоў — Крынічка, Кустовы-98, Шчодры-118, Зграбны; памідораў — Талахін-186, Даходны, Марынадны; кабачкоў — Белаплодны), пародам (буйн. раг. жывёлы — *абердзін-ан-*

гуская парода, герэфордская парода, джэйсерская парода, швіцкая парода; свіней — *эстонская беконная*, брэйтаўская; лівенская; трусоў — *савецкая шыншыла, серабрысты трус, чорна-буры трус*, каліфарнійскі мясны; мяса-воўнавыя пароды авечак; цяжкавозныя пароды коней). Залежыць ад умоў вырошчвання раслін, кармлення і ўтрымання жывёл. Мае эканам. значэнне — больш прадукцыйна выкарыстоўваецца зямля, паскараецца ўзнаўленне і абарот статка, дасягаецца лепшая аплата кармоў.

СКАРАХО́Д Вольга Раманаўна (12.7.1915, г.п. Брагін Гомельскай вобл. — 25.6.1994), бел. хімік. Д-р хім. н. (1971), праф. (1972). Скончыла БДУ (1939), дзе і працавала да 1986. Навук. працы па даследаванні малекулярнай, іонаабменнай і ліганднай сорбцыі арган. злучэнняў на іанітах. Прапанавала метады храматаграфічнага раздзялення блізкіх уласцівасцямі злучэнняў і экстракцыйна-фотаметрычнага вызначэння малібдэну і тытану ў сплавах і мінералах з дапамогай амінааксіфуранону.

Тв.: Химический анализ: Основы методов концентрирования и разделения веществ. Мн., 1980.

СКАРАХО́ДАЎ Уладзімір Паўлавіч (н. 14.2.1939, г. Клімавічы Магілёўскай вобл.), педагог, грамадскі і дзярж. дзеяч. Засл. дз. маст. Беларусі (1997). Акад. Міжнар. АН Еўразіі (1998). Канд. філас. н. (1989). Праф. (1995). Скончыў Бел. кансерваторыю (1963), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1985). З 1963 саліст аркестра Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. З 1968 выкладчык, нам. дырэктара, дырэктар Мінскага муз. вучылішча імя Глінкі. З 1977 у Мін-ве культуры Беларусі (у 1981—88 нам. міністра). Адначасова з 1981 выкладчык Бел. акадэміі музыкі. У 1991—98 і з 2001 рэктар Бел. ін-та праблем культуры. У 1998—2001 дарадца па пытаннях культуры Пасольства Рэспублікі Беларусь у Літве. Член міжнар. арг-цыі па нар. творчасці (з 1994). Вывучае праблемы маст. культуры і адукацыі Беларусі. Аўтар манаграфіі «Мастацкая культура ў дынаміцы сацыяльнага засваення» (1994), навукова-метадычных распрацовак. Сярод вучняў Г.*Забара*, Я.Аўсяннікаў, І.Брычыкаў, А.Вакуленка, А.Дзмітрусік, В.Зубраўскі. *І.Л.Чэбан.*

СКАРБ, 1) дзяржаўная ўстанова ВКЛ у 15—18 ст., якая адказвала за эканам. і фінансавае кіраванне. Мела ўласны штат, куды ўваходзілі *падскарбі* земскі, *скарбны*, скарбовыя пісары і дваране. 2) Сховішча дзярж. даходаў ВКЛ: даніны, чыншу, дзякла, мезлева, асадных пенязяў, судовых пошлін, якія паступалі да вял. князя (віны, перасуды), сярэбшчыны і інш. У С. зберагаліся таксама дзярж. рэгаліі («клейноты і аздобы»), арыгіналы агульназемскіх і абласных прывілеяў, міжнар. дагавораў і інш. Да 2-й пал. 17 ст. на захоўванні ў С. знаходзіліся арыгіналы кніг *Метрыкі Вялікага княства Літоўскага*. С. быў цэнтр. арсеналам ВКЛ. *А.І.Груша.*

СКАРБ, 1) знаходкі комплексаў манет, плацежных зліткаў і разнастайных рэчаў (вырабаў), ухаваных у зямлі ці інш. месцах, уладальнік якіх невядомы. Самыя стараж. С. з эпохі неаліту — каменныя прылады працы і зброя. У 7 ст. да н.э. — 20 ст. н.э. пераважаюць манетныя і манетна-рэчавыя С. (манеты, сярэбраныя і залатыя плацежныя зліткі і іх фрагменты, тавара-грошы рознага тыпу, упрыгожанні і г.д.). У С. позняга сярэдневякоўя пераважалі манеты (манетным лічыцца С., калі ў ім знаходзілася не менш як 5 адзінак). Захоўваліся яны ў розных упакоўках (посудзе, шкатулках, скрынках, скураных і палатняных торбах, драўляных калодах і інш.), часам у камбінаваных (напр., скрутак тканіны, у якім былі грошы, змяшчаўся ў скрынку ці інш. ўпакоўку). Звычайна С. выяўляюць на невял. глыбіні (0,2—1 м), што тлумачыцца выветрываннем, узорваннем ці вымываннем глебы. Знаходкі багатых С. і ўзнікненне легенд, звязаных з імі, садзейнічалі вял. пашырэнню скарбашукальніцтва ва ўсіх краінах. С. з'яўляліся ў выніку адтоку грошай з абарачэння, выключэння ранніх

Да арт. Скарб. Гальшанскі манетны скарб. Пач. 16 ст.



Скарбніца ў былым маёнтку Грозаў (Капыльскі раён Мінскай вобл.). Сярэдзіна 17 ст. Рэканструкцыя.

паўнавагавых (па масе і пробе) манет у параўнанні з больш познімі легкавагавымі, у час войнаў, паўстанняў і інш. грамадска-сац. узрушэнняў ці прыродных катаклізмаў. Паводле заканадаўства знойдзены С. належыць дзяржаве і павінен быць перададзены ў банк ці музей. У Рас. імперыі згодна з указамі 1718 і 1728 С., знойдзеныя на дзярж., грамадскіх і ўдзельных землях, належалі дзяржаве, а на прыватных — землеўладальнікам з правам музеяў набываць іх для нумізматычных калекцый. Да 1917 С. ў Рас. імперыі вывучаліся ў Імператарскай археал. камісіі, у 1919—29 — секцыяй нумізматыкі і гліптыкі Акадэміі матэрыяльнай культуры, з 1930-х г. — у рэсп. музеях. З 1920-х г. той, хто знаходзіў С., атрымліваў узнагароджанне ў памеры 25% ад кошту знаходкі. Тэр. Беларусі багатая на С. і адзінкавыя знаходкі манет. Зафіксавана больш за 1100 С., з іх больш за 100 у Брэсцкай вобл., больш за 200 у Віцебскай, больш за 170 у Гомельскай, каля 140 у Гродзенскай, больш як па 200 у Мінскай і Магілёўскай абл. Самыя стараж. манеты — стараж.-грэч. і рымскія (адпаведна і С., у якіх яны былі) — на тэр. Беларусі з'явіліся ў канцы 1 — пач. 2 ст., пасля некат. перапынку ў 4—8 ст. яны выкарыстоўваліся рэгулярна. 2) У п р а в е — закапаныя ў зямлі або схаваныя інш. спосабам грошы ці каштоўныя прадметы, уласнік якіх не можа быць установлены ці паводле акта заканадаўства страціў на іх права. Паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь С. пераходзіць ва ўласнасць асобы, якой належыць маёмасць (зямельны ўчастак, пабудова і да т.п.), дзе С. быў схаваны, і асобы, якая знайшла С., у роўных долях, калі пагадненнямі паміж імі не ўстаноўлена іншае. У выпадку, калі ў С. былі рэчы, што адносяцца да помнікаў гісторыі або культуры, яны належаць перадачы ў дзярж. ўласнасць. Пры гэтым уласнік маёмасці і асоба, якая знайшла С., маюць права на атрыманне ўзнагароджання ў памеры палавіны кошту знойдзенага. Прысваенне С., які мае вял. каштоўнасць, цягне за сабой крымін. адказнасць.

Літ.: Р я б ц е в і ч В.Н. Нумизматика Беларуси. Мн., 1995.

Ш.І.Бекцінееў, Г.А.Маслыка (права).

СКА́РБНІК, службовая асоба ў феад. Польшчы і ВКЛ, гл. *Скарбны*.

СКА́РБНІЦА, гаспадарчая пабудова для захоўвання каштоўных рэчаў (зброі, дакументаў і інш.). Здаўна вядомы ў Літве, Польшчы, на Украіне. На Беларусі ў 16—19 ст. будавалі ў замкава-палацавых і сядзібных комплексах з каменю, цэглы, дрэва, часам аб'ядноўвалі з капліцамі, жылымі і гасп. пабудовамі (Іўе, Копысь Аршанскага р-на). Склаліся 2 тыпы пабудоў: франтальны, пры якім асн. маст. ролю выконваў багата аздоблены гал. фасад з ганкам ці порцікам, часам з гадзіннікавай вежай у цэнтры (в. Ва-

ронча Карэліцкага р-на), і цэнтрычнаярусны, з кругавой балюстраднай галерэяй у 2-м ярусе (б. маёнтак Грозаў, Капыльскі р-н). Дзверы звычайна падвойныя — вонкавыя (дубовыя) і ўнутр. (жалезныя), вокны з метал. кратамі.

Ю.А.Якімовіч.

«СКА́РБНІЦА ГРА́МАТ», «Скарбніца грамат палскіх, імператарскіх, каралеўскіх, княжацкіх, нацыянальных ухвал, пастаноў розных улад і ўрадаў, якія служаць крытычнаму высвятленню гісторыі Літвы, Літоўскай Русі і суседніх краін» («Skarbiec dyplomatów...»), зборнік гіст. крыніц па гісторыі Літвы і ВКЛ са стараж. часоў да Люблінскай уніі 1569. Складзены І.М.*Даніловічам* на польскай мове, выдадзены пасмяротна Я.Сідаровічам пры ўдзеле М.Круповіча ў 2 тамах у Вільні ў 1860—62. У ёй змешчаны 2383 дакументы з 824 г. да 1569 у асноўным у выглядзе рэгестаў (кароткі пераказ зместу), сярод іх лісты і граматы рымскіх пап, імператараў «Свяшчэннай Рымскай імперыі», каралёў, вял. князёў ВКЛ, магістраў, комтураў і інш. службовых асоб Нямецкага і Інфлянцкага ордэнаў. Пераважаюць дакументы паліт. характару, дыпламат. перапіска, ёсць даравальныя граматы, граматы гарадам на магдэбургскае права, агульназемскія прывілеі, мірныя дагаворы, акты дзярж. уній ВКЛ і Польшчы, асобныя паведамленні з летапісаў.

СКА́РБНЫ, скарбнік, службовая асоба ў феад. Польшчы і ВКЛ у 15—18 ст. С. ВКЛ да сярэдзіны 16 ст. зберагаў скарб ВКЛ, пасля Люблінскай уніі 1569 — намеснік *падскарбія* земскага, вёў улік прыходу ў скарб грашовых сум. С. былі таксама ў ваяводствах і паветах, вялі перапіску па фінансавых пытаннях, складалі інвентары ўладанняў, якія падлягалі абкладанню падаткамі.

Скарбніца сядзібы ў вёсцы Варонча Карэліцкага раёна Гродзенскай вобл. Фота пач. 20 ст.

СКАРБЯ́НКА, Чэрня, рака ў Воранаўскім і Шчучынскім р-нах Гродзенскай вобл., левы прыток р. *Котра* (бас. р. Нёман). Даўж. 23 км. Пл. вадазбору 88 км^2. Пачынаецца каля в. Шынкаўшчына Воранаўскага р-на, у нізоўі цячэ сярод лесу, упадае ў р. Котра за 6 км на ПнУ ад в. Прудцы Шчучынскага р-на. Рэчышча на ўсім працягу каналізаванае. У сярэднім цячэнні прымае сцёк з меліярацыйных каналаў.

П.Скарга.

СКА́РГА, 1)выказванне незадаволенасці з нагоды якіх-н. непрыемнасцей, болю і да т.п. 2) Афіц. заява з просьбай аб устараненні якой-н. несправядлівасці, недакладнасці і г.д. Працэсуальнаму заканадаўству вядомы С. касацыйная, прыватныя, наглядныя, у якіх аспрэчваецца правільнасць і законнасць вынесеных судовых прыгавораў, вызначэнняў, пастаноў. Парадак разгляду такіх С. рэгламентуецца адпаведнымі нормамі права.

СКА́РГА (Павенскі) Пётр (люты 1536, г. Груец Мазавецкага ваяв., Польшча — 12.9.1612), царкоўны і паліт. дзеяч Рэчы Паспалітай; пачынальнік польскай аратарскай прозы. Скончыў Кракаўскую акадэмію (1555), удасканальваў адукацыю ў Рыме. З 1569 чл. ордэна *езуітаў*. З 1574 у ВКЛ. Заснавальнік і першы рэктар (1579—84) *Віленскай езуіцкай акадэміі*. Заснаваў *Полацкі езуіцкі калегіум*, калегіумы ў Рызе і Дэрпце (цяпер Тарту, Эстонія). Вёў актыўную барацьбу супраць *Рэфармацыі*. Дзякуючы аратарскаму таленту заўсёды перамагаў сваіх апанентаў у дыспутах. Здолеў вярнуць уплывовага прыхільніка кальвінізму М.К.*Радзівіла* (Сіротку) у каталіцызм. З 1584 у Кракаве, з 1588 прыдворны прапаведнік караля Жыгімонта III Вазы. Ініцыятар і прапагандыст *Брэсцкай уніі 1596*. Аўтар рэліг.-паліт. твораў «Пра еднасць Божай царквы» (1577), «Жыціі святых» (1579), «Брэсцкі сінод» (1597), «Сеймавыя казанні» (1600), «На трэны і лямонт Тэафіла Арталога» (1600) і інш. Выступаў за моцную цэнтралізаваную дзяржаву на чале з каралём з абсалютнай уладай; аднак дзеянні манарха, на яго думку, павінны абмяжоўвацца правам і радай. Разам з тым паліт. ідэалам лічыў тэакратыю, пад якой разумеў кіраванне царк. улады пры дапамозе караля. Абгрунтоўваў ідэю царк. уніі для ўмацавання духоўнага адзінства дзяржавы. Рэзка крытыкаваў анархізм і разбэшчанасць шляхты, яе класавы эгаізм, сац. няроўнасць і прыгнёт сялянства. Папярэджваў, што прамаруджванне з рэформамі па цэнтралізацыі дзяржавы можа прывесці да падзення Рэчы Паспалітай. У 19 ст. С. разглядаўся польскай інтэлігенцыяй як прарок трагічнага лёсу краіны. Творы С., у т.л. «Брэсцкі сінод» і «Абарона Брэсцкага сінода», пераклаў на бел. мову і выдаў І.*Пацей* пад агульнай назвай «Апісанне і абарона сабору рускага брэсцкага» (1597).

Тв.: Pisma wszystkie. T. 1—4. Warszawa, 1923—26.

Літ.: Шалькевіч В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. Мн., 1999; Tazbir I. Piotr Skarga: szermierz kontrreformacji. 2 wyd. Warszawa, 1983. *В.Ф.Шалькевіч.*

СКАРЛА́ЦІ (Scarlatti), сям'я італьян. кампазітараў; бацька і сын.

Алесандра (2.5.1660, г. Палермо, Італія — 22.10.1725), кампазітар, пачынальнік і буйны прадстаўнік *неапалітанскай опернай школы*. Вучыўся ў свайго бацькі і ў М.-А.Спартоніо, А.В.Амата. У 1672—1722 капельмайстар у т-рах Рыма, каралеўскай капэле (1684—1702), у кансерваторыі Неапаля (1708—17 і выкладаў у ёй). У яго творчасці рэалізаваны гал. тэндэнцыі італьян. муз. барока і опернага мастацтва 17—18 ст. Аўтар опер-серыя (больш як 125, каля 80 страчана), у т.л. «Нявінная памылка» (паст. 1679), «Дзівацтвы кахання, ці Разаўра» (паст. 1690), «Карынфскі пастух» (паст. 1701), «Вялікі Тамерлан», «Мітрыдат Еўпатар» (абедзве паст. 1706), «Трыумф свабоды» (паст. 1707), «Сцыпіён у Іспаніі» (паст. 1714), «Тыгран» (паст. 1715), «Тэлемак» (паст. 1718); камедыі «Трыумф гонару» (паст. 1718); каля 660 кантат, 20 араторый, 20 серэнад, каля 200 мес для 4—10 галасоў, псалмаў, камерна-інстр. музыкі і інш. Оперныя увертюры С. падрыхтавалі паяўленне жанру сімфоніі. Сярод вучняў Ф.Гелініяні, Ф.Дурантэ. Джузепе Даменіка (25.10.1685, г. Неапаль, Італія — 23.7.1757), кампазітар, арганіст, клавесініст-віртуоз. Сын Алесандра. Вучыўся ў свайго бацькі, у Ф.Гаспарыні і Б.Пашкуіні. Працаваў у Лісабоне і Мадрыдзе як арганіст, капельмайстар, кампазітар капэл: з 1701 каралеўскай у Неапалі, з 1705 у Венецыі, 1708 у Рыме, у т.л. з 1713 у папскай. З 1720 прыдворны музыкант партуг. караля ў Лісабоне. З 1729 на службе ў іспанскай каралевы. Гал. месца ў яго творчасці належыць клавірным творам. У яго санатах для клавесіна («экзерсісы») фарміравалася санатнае алегра. Для твораў характэрны апора на танц. жанры, «барочнае» наватарства ў выяўленні магчымасцей клавесіна і ва ўвядзенні тэхн. навін у ігры на ім, якія развіліся ў фп. музыцы кампазітараў-рамантыкаў 19 ст. Сярод твораў: 20 опер, у т.л. «Актавія» (паст. 1703), «Іфігенія ў Аўлідзе» (паст. 1713), 20 кантат, 6 араторый, серэнады, 12 канцэртаў для скр., альта і віяланчэлі, духоўная музыка, 555 твораў для клавіра і інш.

Літ.: Алексеев А.Д. История фортепианного искусства. Ч.1. М., 1962; Окраинец И.А. Доменико Скарлатти: Через инструментализм к стилю. М., 1994; Луцкер П.В., Сусидко И.П. Итальянская опера XVIII в. Ч. 1. М., 1998. *Н.В.Сазановіч.*

СКАРН (ад швед. skarn гразь, адкіды), высокатэмпературная кантактава-метасаматычная, поўнакрышт., масіўная,

светлаафарбаваная горная парода, складзеная з вапнавых, магнезіяльна-жалезістых і марганцавых сілікатаў і алюмасілікатаў. Утвараецца шляхам хім. ўзаемадзеяння кантактуючых алюмасілікатных і карбанатных парод з высокатэмпературнымі растворамі. Паводле механізму пераносу рэчыва адрозніваюць С. дыфузійны (біметасаматычны) і С. інфільтрацыйны; паводле саставу вылучаюць С.: вапнавы, магнезіяльны, марганцавы. Пры класіфікацыі С. ўлічваюць таксама глыбіні і час утварэння адносна кансалідаваных інтрузіўных сілікатных парод, характар працэсаў пры скарнаўтварэнні і інш. фактары. Са С. звязаны радовішчы многіх карысных выкапняў: жалезныя, вальфрамавыя, медныя, свінцова-цынкавыя, малібдэнавыя руды, каштоўныя камяні (гранаты, у т.л. грасуляр, шпінэлі і інш.).

СКАРНЯКО́Ў Уладзімір Іванавіч (н. 18.5.1943, саўгас «Рабочы» Кальчугінскага р-на Уладзімірскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне кардыяхірургіі. Д-р мед. н. (1996). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1966). З 1979 у БелНДІ кардыялогіі. Навук. працы па хірургіі прыроджаных і набытых парокаў сэрца.

Тв.: Хирургия сердца. Мн., 1999 (у сааўт.).

СКАРО́ДНАЕ, вёска ў Ельскім р-не Гомельскай вобл., на р. Славечна. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 35 км на ПдЗ ад г. Ельск, 212 км ад Гомеля, 22 км ад чыг. ст. Славечна. 744 ж., 298 двароў (2001). Лясніцтва, філіял дарожна-эксплуатацыйнага ўчастка. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў, партызан і ахвяр фашызму.

СКАРО́Н (Scarron) Поль (4.7.1610, Парыж — 7.10.1660), французскі пісьменнік. Аўтар бурлескных сатыр. пасланняў і санетаў, трагікамедый «Саламанкскі шкаляр» (1655), «Дон Яфет Армянскі» (паст. 1646), камедый «Жадле, або Спадар-слуга» (паст. 1645), «Тры Даратэі, або Аганьбаваны Жадле» (1646), зб. «Трагікамічныя навелы» (выд. 1661), быта- і нараваапісальнага «Камічнага рамана» (ч. 1—2, 1651—57, ч. 3 завершана А. д'Арфэ ў 1678) пра лёс дэкласаванага маладога чалавека Дэстэна (у пер. з франц. «лёс»), што змагаецца за права на шчасце, каханне, волю. Заснавальнік традыцыі травесційнай іроікамічнай паэмы («Тыфон, або Гігантамахія», 1644; «Вергілій навыварат», 1648—52), якая парадзіруе гераічны эпас і сатырычна выкрывае прыдворную арыстакратыю. Паэма «Вергілій навыварат» паклала пачатак традыцыі травесціравання Вергілія ў еўрап. л-ры, у гэтым шэрагу і бел. паэмы «Тарас на Парнасе» і «Энеіда навыварат».

Тв.: Рус. пер. — Комедии. М., 1964; [Стихи] // Европейская поэзия XVII в. М., 1977.

Г.В.Сініла.

СКАРПЕ́НА, марскі ёрш (Scorpaena porcus), рыба сям. скарпенавых атр. скарпенападобных. Пашырана ў Атл. ак. каля берагоў Афрыкі і Еўропы, у Міжземным і інш. морах. Маларухомая, прыдонная рыба, жыве ў прыбярэжнай зоне.

Даўж. да 31 см. Спіна і бакі з цёмнымі крапінкамі і плямамі. Бруха белаватае. На плаўніках калючкі з цёмнымі палосамі, плямамі і крапінкамі. Галава вял., з вострымі шыпамі і шматлікімі скурыстымі нарасцямі. Мае ядавітыя залозы каля спіннога плаўніка. Для С. характэрна лінька. Корміцца дробнай рыбай і ракападобнымі. Аб'ект промыслу.



Сузор'е Скарпіён.



Скарпіёнава муха.

СКАРПІЁН (лац. Scorpius), адно з 12 сузор'яў *задыяка*. Знаходзіцца ў Паўд. паўшар'і неба. Найб. яркія зоркі 0,8—1,2 (*Антарэс*), 1,6 і 1,9 візуальнай *зорнай велічыні*; 100 зорак ярчэй 6-й зорнай велічыні. У С. знаходзіцца магутная (10^{30} дж/с) крыніца рэнтгенаўскага выпрамянення Sco X=1. З тэр. Беларусі часткова відаць вясной і летам. Гл. *Зорнае неба*.

СКАРПІЁНАВЫ МУ́ХІ (Mecoptera), атрад насякомых. Каля 300 відаў. Пашыраны ўсюды. Вядомы з пермскага перыяду. Трапляюцца ў цяністых месцах, на палянах лісцевых лясоў, паблізу штучных насаджэнняў, на снезе, лёдзе.

На Беларусі адзначаны панорпа, або скарпіённіца звычайная (Panorpa communis), лядоўнік звычайны (Boreus westwoodi).

Даўж. да 3 см. Галава прадаўгаватая, падобная да дзюбы. Ротавы апарат грызучага тыпу. Вусікі ніткападобныя. Крылы празрыстыя, сеткаватыя, у некат. зачаткавыя, ёсць і бяскрылыя віды. Брушка членістае (з 10 сегментаў). Задні канец яго загнуты ўверх, у самцоў уздуты, як у *скарпіёнаў* (адсюль назва). Ператварэнне поўнае. Кормяцца расл. і жывёльнымі рэшткамі, пылком і нектарам кветак, ёсць драпежнікі.

СКАРПІЁНЫ (Scorpiones), атрад членістаногіх кл. павукападобных. 6 сям., да 70 родаў, каля 750 відаў. Вядомы з сілуру. Пашыраны ў трапічных і субтрапічных паясах, на Пд умеранага пояса. Жывуць у камяністых мясцінах, у гарах, пустынях, вільготных лясах, на марскіх узбярэжжах. Звычайны С. роду Buthus, у т.л. жоўты, або стракаты, С. (B. eupeus). Найб. буйны трапічны С. Pandinus.

Даўж. звычайна 5—10 см, трапічнага пандынуса да 20 см. Галавагрудзі ўкрыты суцэльным панцырам з парай сяродзінных і некалькімі парамі бакавых вачэй. Членістая гібкая метасома («хвост») мае на апошнім членіку брушка парную ядавітую залозу, якая адкрываецца на канцы выгнутага джала. *Хеліцэры*

Скарпіёны: 1 — жоўты, або стракаты; 2 — трапічны пандынус.

невял., клюшнепадобныя. Клюшні масіўныя. Дыхаюць лёгкімі. Аплодненне *спрематафорамі*, вонкава-ўнутранае. Жывародныя, некат. адкладваюць яйцы. Начныя драпежнікі. Укол балючы для чалавека, а некат. трапічных — смяротны.

СКАРСЕ́ЗЕ (Scorsese) Марцін (н. 17.11.1942, г. Флашынг, штат Нью-Йорк, ЗША), амерыканскі кінарэжысёр. Скончыў кінафакультэт Нью-Йоркскага ун-та. Лепшыя фільмы С. адметныя аўтабіяграфічнасцю, дакладнай абмалёўкай асяроддзя, увагай да псіхалогіі персанажаў. Сярод фільмаў: «Злыя вуліцы» (1973), «Аліса тут больш не жыве» (1974), «Таксіст» (1976), «Нью-Йорк, Нью-Йорк», (1977), «Апошні вальс» (1978), «Шалёны бык» (1980), «Колер грошай» (1980), «Кароль камедыі» (1982), «Апошняе спакушэнне Хрыста» (1988), «Казіно» (1995) і інш. Творчасці С. прысвечаны дакумент. фільм «Кіно — гэта маё жыццё» (1978, рэж. П.Хейдэн).

СКАРЫ́ЛЬСКІ (Skorulski) Антоній Адам (22.11.1715, Жамойць — 28.1.1777), філосаф, асветнік. З 1730 чл. ордэна *езуітаў*, у 1742 пасвячоны ў ксяндза. Выкладаў філасофію, гісторыю і геаграфію ў езуіцкіх навуч. установах Латвіі і Літвы. Рэктар калегіумаў у Навагрудку (1760 — 64) і Коўне (1764 — 66), у 1766—72 правінцыял літоўскі (кіраўнік Літ. правінцыі ордэна). Рэктар Віленскай акадэміі (1772 — 74; з 1803 Віленскі ун-т). Пасля скасавання ордэна езуітаў (1773) заставаўся белым ксяндзом, з 1775 канонік віленскі. У адзіным творы С. «Каментарыі па філасофіі, або логіцы, гэта значыць метафізіцы, агульнай і спецыяльнай фізіцы» (1755) выкладзены асн. філас. сістэмы Новага часу і адкрыцці ў прыродазнаўстве, прыведзены каштоўныя звесткі па астраноміі, механіцы і інш. галінах ведаў. Лічыў, што існуе толькі адзін свет, а не мноства; ён абмежаваны пэўнымі межамі сваёй велічыні, заснаванай у пэўны час. Адмаўляў асн. палажэнні вучэння М.Каперніка, тэорыі першасных і другасных якасцей, атамізму. Гнасеалагічныя погляды С. знаходзіліся пад уплывам *сенсуалізму*. Паводле С., пазнанне рэчаіснасці пачынаецца з уздзеяння аб'екта на органы пачуццяў; любое адчуванне ўключае 3 элементы: орган пачуццяў, уздзеянне, якое робіцца на яго, і здольнасць да ўспрымання гэтага ўздзеяння. Крытыкаваў тэорыю прыроджаных ідэй і інтуітыўнага пазнання, перасцерагаў ад легкадумнага, некрытычнага адмаўлення ўсялякай новай ідэі без папярэдняга апрабавання яе розумам. Даследаваў праблему лагічнага метаду ў непарыўнай сувязі з традыц. аперацыямі розуму (паняцце, суджэнне і вывад); пры гэтым лагічны метад падзяляў на сінтэтычны, з дапамогай якога пазнанне рухаецца ад простага да складанага, ад частак да цэлага, ад прычыны да выніку, і аналітычны, пры дапамозе якога розум вяртаецца ад складанага да простага, ад усеагульнага да адзінкавага.

Тв.: Рус. пер. — Комментарии по философии, или логике, то есть метафизике, общей и специальной физике. Вильна, 1755 // Памятники философской мысли Белоруссии XVII — первой половины XVIII в. Мн., 1991.

Літ.: Бирало А.А. Философская и общественная мысль в Белоруссии и Литве в конце XVII — середине XVIII в. Мн., 1971; Дорошевич Э.К. Философия эпохи Просвещения в Белоруссии. Мн., 1971; Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии (до 1917 г.). Мн., 1973; Цукерман А.Я. Философская мысль в Белоруссии середины XVIII в. Мн., 1980.

С.Ф.Дубянецкі.

СКАРУ́ТА Таццяна Мікалаеўна (н. 6.10.1924, Тбілісі), бел. актрыса. Засл. арт. Беларусі (1961). Скончыла студыю пры т-ры «Чырвоны факел» (г. Новасібірск, 1974). Працавала ў т-рах Новасібірска, Якуцка, Златауста. У 1956—81 у Гомельскім абл. драм. т-ры. Выканаўца роляў травесці, характарных. Акцёрскай манеры ўласціва выразнасць знешняга малюнка і дынаміка ў раскрыцці ўнутранай сутнасці персанажа, удалае выкарыстанне сцэнічнай дэталі. Сярод роляў у Гомельскім т-ры: Рыгорка («У бітве вялікай» А.Маўзона), Ермаліцкая («Рудабельская рэспубліка» паводле С.Грахоўскага), Зося («Сэрца на далоні» паводле І.Шамякіна), Дунька («Любоў Яравая» К.Транёва), Клюка («Угрум-рака» паводле В.Шышкова), Марыя Іпалітаўна, Тузікава («Мана для вузкага кола», «Барабаншчыца» А.Салынскага), Ефрасіння Патапаўна («Беспасажніца» А.Астроўскага), Цвятаева («Мяшчане» М.Горкага), Дорка («Зімовая казка» У.Шэкспіра), Селія («Дурнічка» Лопэ дэ Вэгі), Канчэта («Каляды ў хаце сіньёра Куп'ела» Э.Дэ Філіпа). *А.А.Лабовіч.*

СКАРЦАНЕ́Р, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Чарнакорань*.

СКАРЫ́НА Францыск (каля 1490, г. Полацк Віцебскай вобл. — каля 1551), бел. і ўсх.-славянскі першадрукар, асветнік-гуманіст, пісьменнік, грамадскі дзеяч, вучоны-медык. Дакладная дата нараджэння невядома. Супастаўленне звестак пра паступленне ў Кракаўскі ун-т (1504) і абароны доктарскай дысертацыі ў Падуанскім ун-це (1512), дзе ён названы «маладым чалавекам», дае падставы прыняць 1490 як прыблізны год яго нараджэння (дапушчальна і 2-я пал. 1480-х г.). Звесткі пра сям'ю С. вядомы з канца 15 ст. Бацька С. — Лук'ян Скарына згадваецца ў спісе рас. пасольскіх прэтэнзій 1492 да полацкіх купцоў. Старэйшы брат С. Іван названы ў каралеўскім дэкрэце адначасова віленскім мешчанінам і палачанінам. Невядома і хроснае імя С. Гіпотэза пра тое, што С. іменаваўся Георгіем, новымі дакументальнымі адкрыццямі не пацвярджаецца. У сваіх выданнях С. больш за 100 разоў выкарыстоўвае імя «Франциск», зрэдку «Францишек». У актах ВКЛ на лац. мове яго імя называюць «Franciscus», на бел. мове «Франьцышак», «Франьцышъко». Першапачатковую адукацыю С. атрымаў, відаць, у Полацку. Тут або ў сталіцы ВКЛ Вільні прайшоў ён і далейшыя школьныя навукі, авалодаў лац. мовай. У зімовы семестр 1504 С. паступіў у Кракаўскую акадэмію (ун-т) на факультэт вольных мастацтваў або філасофіі. У Кракаве С. ўсвядоміў навуч. і асветніцкія магчымасці друкаванай кнігі. У 1506 ён вытрымаў экзамен на ступень бакалаўра вольных мастацтваў. Невядома, дзе С. знаходзіўся ў 1507—12. Магчы-

Ф.Скарына.

ма, ён скончыў ун-т і ў Празе, дзе атрымаў ступень доктара філасофіі, але больш верагодна, што доктарскі дыплом ён атрымаў у Кракаве. Запіс у акце Падуанскага ун-та 9.11.1512 сведчыць пра тое, што ён быў сакратаром караля «Дацыі» (?). Не пазней восені 1512 С. прыбыў у г. Падуя, каб набыць ступень доктара медыцыны. Можна меркаваць, што грунтоўную мед. адукацыю С. атрымаў у Кракаве або ў Падуі ці Балонскім ун-це. 9.11.1512 С. абараніў ступень доктара мед. навук. Пра дзейнасць С. ў 1513—16 дакумент. звесткі не выяўлены, але менавіта ў гэты час ён вырашыў пачаць кнігадрукаванне. У 1510-я г. С. наведаў Вільню, Полацк, інш. гарады ВКЛ і заручыўся падтрымкай суайчыннікаў. Інтэнсіўная выдавецкая дзейнасць С. ў Празе ў 1517—19 дазваляе думаць, што ён пасяліўся тут не пазней як у 1516. 6.8.1517 С. выдаў сваю 1-ю кнігу — Псалтыр. На працягу наступных 2 гадоў ён выдаў 19 кніг (або 22, калі лічыць кнігі «Царстваў» за 4) Старога Запавету: «Іоў», «Прытчы Саламона», «Ісус Сірахаў» (усе 1517), «Еклесіяст», «Песня песням», «Прамудрасць Божая», «Царствы», «Ісус Навін» (усе 1518), «Юдзіф», «Суддзі», «Быццё», «Выхад», «Левіт», «Лічбы», «Другі закон», «Руф», «Эсфір», «Плач Ераміі», «Прарок Данііл» (усе 1519). Некат. з апошніх выданняў, якія не маюць выхадных звестак і традыцыйна датуюцца 1519, магчыма, надрукаваны ў 1520. У пач. 1520-х г. С. пераехаў у Вільню, дзе каля 1522 выдаў «Малую падарожную кніжку», якая складаецца з 23 частак: «Пісаныя рэчы», Псалтыр, «Часаслоўец», «Акафіст магіле гасподняй», «Канон магіле гасподняй», «Акафіст архангелу Міхаілу», «Канон архангелу Міхаілу», «Акафіст Іаану Прадцечы», «Канон Іаану Прадцечы», «Акафіст Багародзіцы», «Канон Багародзіцы», «Акафіст святым Пятру і Паўлу», «Канон святым

Пятру і Паўлу», «Акафіст святому Міколе», «Канон святому Міколе», «Акафіст крыжу гасподняму», «Канон крыжу гасподняму», «Акафіст Ісусу», «Канон Ісусу», «Шасцідневец», «Канон пакаяльны», «Канон на ютрані», «Саборнік». Некат. часткі, магчыма, выходзілі як асобныя выпускі. У 1525 у Вільні С. выдаў кн. Апостал. З сярэдзіны 1520-х г. С. служыў сакратаром віленскага біскупа Яна, займаўся і мед. дзейнасцю. У Вільні ён ажаніўся з Маргарытаю, удавой віленскага радцы Юрыя Адверніка, і жыў у яе камяніцы на Нямецкай вул., недалёка ад палаца князёў Слуцкіх. Як лічаць даследчыкі, у канцы 1520 — пач. 1530-х г. С. наведаў Маскву, каб распаўсюдзіць там свае выданні. У 1530 па нейкіх прычынах ездзіў у Кёнігсберг да герцага Альбрэхта. Відаць, гэта было звязана з распаўсюджаннем у 1529—30 у Прускім герцагстве пандэміі т.зв. англ. гарачкі. Паводле інш. меркаванняў, увагу герцага прыцягвала асветніцкая і выдавецкая дзейнасць С. У канцы 1520 — пач. 1530-х г. матэрыяльнае становішча С. пагоршылася: памерлі амаль усе апекуны яго выдавецкай дзейнасці (Якуб Бабіч, Багдан Онкаў, Рыгор Адвернік); пачаліся судовыя працэсы ў Вільні з-за маёмасці жонкі, як удзельнік гандлёвых аперацый нябожчыка брата Івана С. быў зняволены на некалькі месяцаў у познанскай турме; пажар 1530 знішчыў значную частку Вільні, магчыма, і яго друкарню; апякун С. віленскі біскуп Ян у 1536 пераведзены ў Познань, дзе неўзабаве памёр. Спалучэнне розных абставін і адсутнасць падтрымкі вымусілі С. пакінуць ВКЛ і ад'ехаць у Прагу.

У канцы 1530-х г., магчыма, і ў 1540-я г. С. працаваў садоўнікам каралеўскага парку на Градчанах. Невядомы і дакладны час смерці С. Відаць, гэта здарылася каля 1551, бо ў студз. 1552 яго сын Сімяон атрымаў ад чэшскага караля прывілей на права атрымаць спадчыну бацькі. Свае прэтэнзіі на маёмасць С. ў 1552 аб'явілі Марцін Онкавіч і лаўнік віленскага магістрата купец Тоўсцік. Некат. даследчыкі лічаць, што С. памёр да 1541. Месца пахавання С. таксама невядома.

Заснаванне С. бел. кнігадрукавання стала вяршыняй яго духоўнай дзейнасці, найб. яскравым і выразным пралогам бел. Адраджэння. У друкаванай кнізе С. бачыў невычэрпныя магчымасці духоўнай асветы народа, выхавання высокіх хрысц. маральных і грамадзянскіх якасцей, усё большага далучэння і актыўнага ўзаемадзеяння з еўрап. культурай. Ажыццяўленню яго плана спрыялі падарожжы па краінах з развітым кнігадрукаваннем (Польшча, Чэхія, Італія і інш.) і матэрыяльная падтрымка бел. мяшчан Вільні і Полацка. У адрозненне ад Польшчы, дзе друкарская справа была манапалізавана, а таксама духавенства і вярх. ўлада не падтрымлівалі падобных праектаў, больш спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі сваіх планаў С. бачыў у Чэхіі. Менавіта ў Празе ён завяршыў пераклад і каменціраванне тэкстаў Біблії на падставе лац., чэшскіх, стараж.-яўр. і царк.-слав. крыніц і ў 1517—19 выдаў 23 кнігі Старога запавету («Бівліі рускай»). Віленскія выданні 1520-х г. — «Малая падарожная кніжка» і Апостал — больш звязаны з традыцыйнай бел. і ўсх.-слав. кніжнасцю (за выключэннем некат. дадаткаў, арнаментыкі і каментарыяў С.) і выдаваліся на царк.-слав. мове. У Вільні С. меў сваю друкарню ў доме бурмістра Якуба Бабіча і займаўся непасрэднымі друкарскімі справамі. Бел. кнігадрукаванне пачалося адразу на высокім еўрап. узроўні. Рэнесансавыя выданні С. вылучаюцца высокімі выдавецкімі і друкарскімі якасцямі, адметныя мастацкім, гравюрным, арнаментальным упрыгожаннем, шрыфтам і інш. кампанентамі выдавецкай эстэтыкі і майстэрства. Яны вылучаліся практычнымі памерамі, а каментарыі разлічаны на ўспрыняцце простым («паспалітым») людам. З гэтай мэтай ён тлумачыў на палях кнігі архаічныя царк.-слав. словы «рускай мовай». Інш. маргіналіі С. павінны былі падкрэсліць духоўнае адзінства Св. пісання. З замежных, магчыма, славянскіх выданняў С. запазычыў падзел псалмоў на вершы. Кнігі С. зрабілі вял. ўплыў на развіццё духоўнай культуры Беларусі і Украіны, стымулявалі ўзнікненне кнігадрукавання ў Маскоўскай Русі, распаўсюджваліся ў шматлікіх рукапісных копіях. Арнаментальныя матэрыялы Віленскай друкарні С. да 1652 выкарыстоўваліся ў выданнях найбуйнейшай бел. друкарні — *Віленскай брацкай друкарні* і *Еўінскай друкарні*, а пражскія ініцыялы сустракаюцца ў выданнях Астрожскай друкарні на Украіне ў канцы 16 ст. На думку даследчыкаў, рэнесансавыя гравюры пражскіх выданняў С. выконвалі прадстаўнікі розных мастацкіх школ пры ўдзеле самога С. (партрэт С. да кніг «Ісус Сірахаў» і «Царствы»). У Віленскай друкарні С., безумоўна, працавалі і бел. мастакі, гравёры, рамеснікі, друкары. Маргінальныя запісы 16—18 ст. на кнігах С. сведчаць пра актыўнае іх выкарыстанне рознымі пластамі бел. і замежных чытачоў. Выданні С. з'яўляюцца выдатнымі помнікамі рэнесансавага пісьменства. Іх месца ў еўрап. і бел. культ.-гіст. працэсе вызначаецца гіст. ўмовамі, традыцыямі, своеасаблівасцю і былі арыентаваны на ўсе пласты насельніцтва, прызначаліся для прыважнага і сямей-

Ф.Скарына. Гравіраваны партрэт з кнігі «Быццё». Прага.

нага чытання, выкарыстання ў царк. службах і свецкіх б-ках. агульным узроўнем духоўнага развіцця Беларусі і ўсх.-слав. зямель ВКЛ. Біблія С. не адпавядае ніводнаму з вядомых рукапісных ці друкаваных зводаў Св. пісання. Яна адыходзіць ад царк. традыцый не столькі складам і зместам, колькі агульнай накіраванасцю, свецкай хрысціянскай прыўзнятасцю, грамадскімі, нац.-патрыятычнымі, гуманістычнымі і асветніцкімі тэндэнцыямі.

Творы С. ўяўляюць сабой сукупнасць уступных, заключных і каменціруючых матэрыялаў, дастасаваных да адпаведных біблейскіх кніг і ствараюць з імі і з усёй Бібліяй арганічную цэласнасць. Асн. ролю адыгрываюць «предъсловия» і блізкія да іх «сказания». У пражскіх выданнях змешчаны 21 прадмова і 4 сказанні, у віленскіх — адпаведна 2 і 21. Большасць даследчыкаў адносіць прадмовы і сказанні да адной жанравай разнавіднасці, на думку іншых, сказанні бліжэй да пазнейшых бел. пропаведзяў, казанняў. Яны звычайна больш сціслыя, адрозніваюцца сваёй стылістыкай, красамоўствам, насычаны багаслоўскай рыторыкай. Кнігі С. былі арыентаваны на ўсе пласты насельніцтва, прызначаныя для прыватнага і сямейнага чытання, выкарыстання ў царк. службах і свецкіх б-ках. Каб пазбегнуць спрошчанага ці памылкавага ўспрыняцця Бібліі, С. імкнуўся ў простай і зразумелай форме каменціраваць біблейскія тэксты, падаваць звесткі па гіст., побытавыя, багаслоўскія, моўныя рэаліі. У тэалагічным кантэксце асн. месца ў прадмовах і сказаннях С. займае т. зв. экзагеза — тлумачэнне алегарычнага зместу кніг Старога запавету. Комплекс прадмоў і сказанняў С. дапаўняюць калафоны — сціслыя ўступныя каментарыі да раздзелаў кожнай кнігі. У іх дасканалыя выяўл. сродкі, публіцыстычнасць, экспрэсіўнасць, прытчавы і алегарычны характар, багацце гіст., філас., тэалагічных каментарыяў, сугучнасць узнёслай моўнай стылістыцы Бібліі. Празаічныя творы С. ў «Малой падарожнай кніжцы» ўпрыгожвае і дапаўняе вял. гімнаграфічны цыкл, у т.л. аўтарскія гімны. Побач з аўтарскай прозай у прадмовах С. прасочваюцца прыкметы інш. літ. жанраў, якія пазней занялі значнае месца ў бел. л-ры і пісьменстве, у т.л. сілабічнае вершаскладанне (вольны пераклад дэкалога ў прадмове да кн. «Выхад» і інш.). Спасылкі С. на старажытнаўр., грэч., слав. і лац. пераклады, на багаслоўскія і каменціруючыя творы ант. і сярэдневяковых аўтараў сведчаць пра тое, што сваю дзейнасць ён разглядаў у рэчышчы айчынных, агульнаеўрап. і агульнахрысц. культ.-гіст. працэсаў як этап духоўнага прасвятлення, хрысціянізацыі, маральнага ачышчэння і ўдасканалення свайго народа. З тэалагічнымі і канкрэтна-біблейскімі каментарыямі С. арганічна звязаны аўтарскія разважанні, адступленні, трактоўкі, апісанні, пропаведзі, што дазваляе меркаваць пра яго грамадскія і інш. погляды.

Да арт. **Скарына Ф.** Тытульны ліст «Псалтыра». Прага. 1517.

Своеасаблівасць літ. і выдавецкай дзейнасці С. выразна засведчана ў жанрава-тэматычным выбары першадрукаў, іх унутр. структуры, перакладзе і каментарыях, маст., літ.-пісьменніцкіх, філас. і моўных рысах яго выданняў, у агульнай арыентацыі яго творчасці на патрэбы Айчыны і народа. Упершыню ў гісторыі Беларусі былі так цесна зліты ідэі адзінства і прымату хрысціянскай і этнічнай свядомасці. Яскравым пацвярджэннем этнагіст. і патрыят. свядомасці С. з'яўляецца яго замілаванне Полацкам і Полаччынай. Яно напаўняла яго любоўю да сваёй малой радзімы, сям'і, жаданнем служыць свайму народу, распаўсюджваць хрысціянскія і ренесанса-гуманістычныя погляды, натхняць на асабістую і грамадскую актыўнасць, дасканаласць, на спасціжэнне высокіх сэнсаў зямнога быцця і боскіх запаветаў. Звяртаючыся ў сваіх кнігах да ўсяго народа, С. заснаваў у бел. л-ры навук.-асветніцкую, маральна-дыдактычную, філас. публіцыстыку. Асн. метадам публіцыст. актуалізацыі біблейскай праблематыкі стала яе гуманіст. інтэрпрэтацыя, накіраваная на ўдасканаленне сац.-паліт., прававых і маральна-бытавых ін-таў грамадства. На думку С., кніга «Іоў» — люстэрка жыцця, лекі для збалелай душы. Аповесць пра подзвіг Юдзіфі — узор патрыятызму, самаахвярнасці, бескарыслівага служэння грамадскаму дабру. Любоў да Радзімы — самае першае і высокае духоўнае пачуццё: «Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птици, летающие по воздуху, ведають гнезда своя; рибы, плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, — тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають». Важнае месца ў творчасці С. займала сцвярджэнне духоўнай каштоўнасці роднай мовы. Каб надаць сваёй публіцыстыцы пераканаўчасць, ён карыстаўся рознымі выяўл. сродкамі красамоўства, стыліст. фігурамі, паўторамі, рытарычнымі воклічамі, пытаннямі. У яго прозе спалучаны асаблівасці пісьмовай і гутарковай мовы.



Да арт. **Скарына Ф.** Тытульны ліст «Бібліі» з кнігі «Быццё». Прага. 1519.

Літ.-эстэт. погляды С. адметныя кампрамісам паміж хрысціянскім этычным ідэалізмам з характэрным для яго маральным рыгарызмам і рэнесансавым гуманізмам, арыентаваным на зямную гармонію і красу. Паняцце прыгожага ўжывалася С. у эстэт., этычных, утылітарна-практычных значэннях. Сінтэз фалькл. і хрысц. разумення гэтага паняцця выявіўся ў трактоўцы прыгажосці як жыватворнага пачатку зямнога быцця. Літаратурны, свецкі аспекты прыгажосці падкрэсліваецца ім у вызначэнні стараж. грэкаў як мудралюбцаў і красамоўцаў. Паняцце агіднага С. абазначаў тэрмінамі «прыкрость», «неуставичность», «мерзость». Катэгорыя ўзнёслага азначае ў яго не толькі атрыбут Бога, але і духоўную ці грамадзянскую веліч чалавека (узнёсла-гераічны вобраз Юдзіфі). Грамадзянска-патрыятычны аспект узнёслага — у скарынаўскіх тытулах «вялікіх», «вялікаслаўных» гарадоў Полацка, Вільні і Прагі. У прадмовах і анатацыях С. развіваў традыц. хрысц. і фальклд. дыялектыку ўзаемапераходу нізкага і высокага: не толькі Бог «возводить смиренныя на высокость и немощные приводить къ полному здравию» (кн. «Іоў»), але і

мудрасць, духоўны подзвіг «узносіць паніжанага», паказваючы «высокость свою и славу» (анатацыя да кн. «Ісус Сірахаў»). Катэгорыю трагічнага С. раскрывае тэрмінамі «беды і немоци». Разуменне трагічнасці жыцця, паводле яго канцэпцыі, уваходзіць у панятце чалавечай мудрасці. У творах С. сінтэзаваліся ант. і сярэдневяковыя традыцыі з ідэалогіяй еўрап. Адраджэння, хрысц. гуманізм з рэнесансава-гуманістычнымі ўяўленнямі. Яго канфесіянальныя погляды вызначаюцца талерантнасцю.

С. высока ацэньваў выдатных дзеячаў ант. свету, знакамітых біблейскіх герояў, пазітыўна ставіўся да сучаснага яму караля польскага і вял. князя ВКЛ Жыгімонта I. Як абгрунтаванне саслоўнаманархічнага ладу, удасканалення земскага заканадаўства ўспрымалася сучаснікамі С. яго апісанне стараж. правоў і статутаў, заключаных у біблейскіх кнігах: права паспалітае, язычніцкае, царскае, рыцарскае, гарадское, марское, купецкае і інш. Паліт. і сац. погляды С. складваліся пад уздзеяннем рэальных працэсаў, што адбываліся ў ВКЛ, Польшчы, інш. еўрап. краінах. Паліт. ідэалам С. была, відаць, моцная і асвечаная манархічная ўлада, якая падтрымлівае хрысц. справядлівасць, законнасць, правасуддзе, мірныя зносіны з суседзямі, спрыяе развіццю духоўнай культуры, гандлю, рамяства. Увасабленне свайго ідэалу С. бачыў у дзейнасці стараж.-грэч. і рым. цароў і заканадаўцаў: Салона, Нумы Пампілія, Лікурга, егіпецкага цара Пталамея IV Філапатара і інш. Значная ўвага С. да пытанняў права, ролі народаў у выпрацоўцы законаў, ідэй справядлівасці, роўнасці ўсіх людзей перад законам сведчыць пра тое, што ён быў занепакоены рэальным станам спраў на сваёй Радзіме, з'явамі сац. дыскрымінацыі, феад. анархіі, свавольства. Духоўная спадчына С. асэнсавана і ў значнай ступені ўспрынята і развіта наступнымі пакаленнямі выдатных бел. мысліцеляў, гуманістаў-асветнікаў.

Жыццё і дзейнасць С. вывучае комплексная навук. дысцыпліна — *скарыназнаўства*. Імем С. названы праспект у Мінску, вуліцы ў Полацку, Віцебску, Нясвіжы, Оршы, Слуцку і інш., Гомельскі ун-т, Помнікі С. пастаўлены ў Полацку, Лідзе, Мінску, Вільнюсе. Уведзены дзярж. ўзнагароды Беларусі — медаль С. (1989) і ордэн С. (1995).

Тв.: Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. Мн., 1990; Біблія. Т. 1—3. Мн., 1990—91.

Літ.: Владимиров П.В. Доктор Франциск Скорина. Его переводы, печатные издания и язык. СПб., 1888; Чатырохсотлецце беларускага друку, 1525—1925. Мн., 1926; Флоровский А.В. Чехи и восточные славяне: Очерки по истории чеш.-рус. отношений. Т.2. Прага, 1947; Алексютовіч М.А. Скарына, яго дзейнасць і светапогляд. Мн., 1958; 450 год беларускага кнігадрукавання. Мн., 1968; Подокшин С.А. Скорина и Будный. Мн., 1974; Яго ж. Франциск Скорина. М., 1981; Яго ж. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мн., 1990; Конон В. М. От Ренессанса к классицизму: (Становление эстет. мысли Белоруссии в XVI—XVIII вв.). Мн., 1978; Яго ж. Боская і людская мудрасць: (Францішак Скарына: жыццё, творчасць, светапогляд). Мн., 1990; Анічэнка У.В. Слоўнік мовы Скарыны. Т. 1—3. Мн., 1977 — 94; Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. М., 1979; Мальдзіс А. Францыск Скарына як прыхільнік збліжэння і ўзаемаразумення людзей і народаў. Мн., 1988; Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед. Мн., 1988; Францыск Скарына: Зб. дак. и матэрыялаў. Мн., 1988; Анічэнна У.В., Жураўскі А.І. Беларуска-іншаславянскі сінкрэтызм мовы выданняў Францыска Скарыны. Мн., 1988; Спадчына Скарыны: Зб. матэрыялаў першых Скарынаўскіх чытанняў (1986). Мн., 1989; Францыск Скорина — белорусский гуманист, просветитель, первопечатник. Мн., 1989; Каўка А. Тут мой народ: Францішак Скарына і бел. літ. XVI — пач. XX стст. Мн., 1989; Тумаш В. Пяць стагодзьдзяў Скарыніяны, XVI—XX: [Бібліягр.]. Нью Ёрк, 1989; Францыск Скорина и его время: Энцикл. справ. Мн., 1990; Лойка А. Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае. Мн., 1990; Яго ж. Скарына на Градчанах. Мн., 1990; Яго ж. Старабеларуская літаратура. Мн., 2001; Францыск Скорина и традиции гуманизма в славянской культуре: Тез. докл. и сообщений на науч. конф., посвящ. 500-летию со дня рождения Ф.Скорины. Мн., 1990; Булыка А.М., Жураўскі А.І., Свяжынскі У.М. Мова выданняў Францыска Скарыны. Мн., 1990; Лабынцаў Ю. Пачатае Скарынам: Бел. друкаваная літ. эпохі Рэнесансу. Мн., 1990; Яго ж. Скарынаўскі каляндар: (Да 500-годдзя з дня нараджэння Ф.Скарыны). 2 выд. Мн., 1990; Немировский Е.Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность бел. просветителя. Мн., 1990; Скарына і яго эпоха. Мн., 1990; Чамярыцкі В.А. Беларускі тытан эпохі Адраджэння. Мн., 1990; Шматов В.Ф. Искусство книги Франциска Скорины. М., 1990; Дварчанін І. Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве: Пер. з чэш. Мн., 1991; Франциск Скорина и Вильнюс: Сб. материалов Респ. науч. конф. Вильнюс, 1991; Галенчанка Г.Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. Мн., 1993; Запісы Бел. Ін-та навукі і мастацтва. Нью-Ёрк. 1994. Кн. 21; Яскевіч А.А. Творы Ф.Скарыны: Жанравая структура. Філас. погляды. Мастацтва слова. Мн., 1995; 480 год беларускага кнігадрукавання. Мн., 1998; Агіевіч У.У. Сімволіка гравюры Скарыны. Мн., 1999. Гл. таксама да арт. *Скарыназнаўства*.

Г.Я.Галенчанка, У.М.Конан.


ПИСАНЫЙ РЕЧИ:-

ВСЕИ МАЛОИ ПОДОРѢЖНОИ

книжце порадку кратце положены сутъ:-
И в первей Ѵйатыя зупольна • иясти
хи статиямі разделена, внейже знайде
шн стиховъ, йли припелок • две тысещи
йшесть сотъ • Зникождо кнісмой зи
стяеніи болшна • й покождон славе, зи
стяеніи меншя • для лепшего разделе
нна чтущима положены сутъ :-
З и Ѵйатырію пѣсней десеть, свещіяго
й словяго закону божна йзбранные:-
Потома чясословецъ, йма ноцінуѣ, й
днесную служебу Ѵ напреды полуночница
глтмя повсѣ дни, кроме соботъ, й недель
А рутя полуночница пѣшемн есуботы
Т ретмя полуночница, повсѣ воскресе
нна • скяною тройчымъ глясн й, тео
рен на преподобныгр ѻцы і ѻтнія дамяки

Да арт. **Скарына** Ф. Пасляслоўе да «Малой падарожнай кніжкі». Вільня. Каля 1522.


Почнн ётьсн книга
дѣяннй • йпосѣля
нна йпостольскаи зо
вемая йпостолъ, збо
жію помочью справѣ
лена докторомъ франъ
цискомъ скориною
сполоцькя:-

Да арт. **Скарына** Ф. Тытульны ліст «Апостала». Вільня. 1525.

СКАРЫНАЗНА́ЎСТВА, комплексная навук. дысцыпліна, якая вывучае жыццё і дзейнасць Ф.*Скарыны*, яго творчую і духоўную спадчыну, асяроддзе, эпоху, публікацыю крыніц і крыніцазнаўчыя даследаванні. У шырокім сэнсе ў С. ўключаюцца таксама навук. і папулярныя публікацыі, маст. творы (літ. і выяўл. мастацтва, кінафільмы, тэатр. пастаноўкі, паштовыя маркі і г.д.), канферэнцыі, юбілейныя форумы, прысвечаныя Скарыне і яго пераемнікам, асэнсаванне яго ролі ў развіцці айч., еўрап. і сусв. культуры ад сярэдневякоўя да сучаснасці.

Першыя звесткі пра кнігі Скарыны занатаваны яшчэ пры яго жыцці (віленскі святар Мацвей, 1522; пратэстанцкі біскуп Прусіі П.Сператус, каля 1530; італьян. мовазнавец Т.А.Альбанезі, 1539, і інш.). Дзейнасць Скарыны прыцягвала ўвагу пісьменнікаў, палемістаў, гісторыкаў 16—17 ст. найперш з-за біблейскай тэматыкі, моўных, рэд., перакладчыцкіх і друкарскіх своеасаблівасцей яго выданняў. У часы Адраджэння, Рэфармацыі і пазней выданні Скарыны неадназначна ўспрымаліся паліт. і культ. дзеячамі (С. Будны, І.Фёдараў, А.Курбскі, Ш.Старавольскі), іерархамі розных канфесій, прадстаўнікамі полі-этнічнай інтэлігенцыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Звесткі італьян. публіцыста П.П.Вергерыя (Верджэрыо) пра «рус. Біблію», якую ён бачыў у Вільні ў 1550-я г., паўтораны Ж.Ле Лонгам (1709), І.-П. Колем

(1729), Я.-Д.Гофманам (1740). У сярэдзіне 18 ст. ням. даследчык С.В. Рынгельтаўб адзначаў кнігі Скарыны толькі як адну з крыніц больш позніх пратэстанцкіх перакладаў Бібліі Буднага. Станаўленне рэтраспектыўнай бібліяграфіі ў Расіі ў канцы 18 — пач. 19 ст. (пасля падзелаў Рэчы Паспалітай) паставіла пытанне пра пашырэнне гіст. і культуралагічных славяназнаўчых даследаванняў у новых этнатэрытарыяльных межах, што дало пазітыўныя вынікі і ў вывучэнні спадчыны Скарыны. У працах І.Р.Бакмейсцера, І.Г.Штрытэра, П.А.Аляксеева апісаны асобныя кнігі Скарыны, прыведзены фрагментарныя звесткі з яго біяграфіі, высвятляліся аспекты яго рэдакцыйна-перакладчыцкай дзейнасці ў параўнанні з маскоўскімі выданнямі і зах.-еўрап. традыцыямі. Чэшскі славіст і асветнік І.Добраўскі першы адзначыў, што кнігі Скарыны прызначаліся «простым русінам», а «літоўская мова яго выданняў значна адрозніваласа ад традыцыйных царкоўнаславянскіх рукапісаў». Ён даказаў, што Скарына пры перакладзе Бібліі карыстаўся чэшскім перакладам Вульгаты, а яго Біблія друкавалася ў чэшскай, а не варшаўскай Празе. У сярэдзіне 19 ст. рас. мастацтвазнавец Дз.А.Равінскі адзначаў арыгінальнасць, высокі ўзровень і якаснае тэхн. выкананне фігурных гравюр у пражскай Бібліі, апісаў іх тэматыку. На яго думку, гравюры Скарыны не маюць аналагаў у еўрап. кнігадрукаванні. Ён высока ацаніў партрэт Скарыны, «падпісаны невядомым майстрам». Лічыў, што віленскае кнігадрукаванне не дасягнула ўзроўню пражскіх выданняў. У.В.Стасаў звярнуў увагу на маст. вартасць, дасканаласць і «тонкасць» віленскіх ініцыялаў і застаўак. Гэтыя асаблівасці малых кніжак Скарыны (разам з вельмі добрым шрыфтам) робяць іх падобнымі да слав. «эльзевіраў». Стасаў выказаў меркаванне, што ў пражскай друкарні Скарыны працавала некалькі гравёраў, у т.л. «славянскага племені», што ў гравюрах «адчуваецца славянскі тып твару і адзення». На думку археографа А.Я.Віктарава, пражскі Псалтыр 1517 найб. адпавядаў рэліг. і кніжна-асветніцкім патрэбам «рускага» насельніцтва. Ён крытыкаваў сцвярджэнні некат. даследчыкаў (Я.Ф.Галавацкага, В.Копітара) адносна каталіцкіх або рэфармацыйных поглядаў Скарыны. Найб. грунтоўна наяўныя на той час выданні Скарыны апісаў В.С.Сопікаў. Поўнае і разгорнутае апісанне ўсіх вядомых пражскіх і віленскіх выданняў Скарыны зрабіў І.П.Каратаеў у бібліягр. працах 1878 і 1883. Больш плённы перыяд у С. пачаўся з выхадам у свет доктарскай дысертацыі славіста П.У.Уладзімірава «Доктар Францыск Скарына: Яго пераклады, друкаваныя выданні і мова» (1888), якая адкрывалася гістарыяграфічным даследаваннем. Дзейнасць Скарыны ён разгледзеў на фоне «маральна-рэлігійнага і духоўнага» жыцця ВКЛ і падкрэсліў важную яго ролю ў стварэнні духоўных перадумоў для культ. і грамадска-паліт. актыўнасці мяшчанства, для пашырэння кантактаў з краінамі Цэнтр. і Зах. Еўропы, для эвалюцыі кніжнага пісьменства, пранікнення нар. мовы ў л-ру. Па дакумент. крыніцах ён узнавіў жыццёвы шлях Скарыны, адзначыў яго «заходнярускае» паходжанне, сувязі з родным Полацкам, спрабаваў звязаць дзейнасць Скарыны з культ. развіццём «заходнярускіх» зямель канца 15 — пач. 16 ст., прааналізаваў амаль усе вядомыя на той час спісы выданняў Скарыны, асабліва рэдкія рукапісы, якія, магчыма, данеслі да нас тэксты нявыдадзеных або страчаных кніг Скарыны. Значная частка гэтай працы прысвечана характарыстыцы мовы скарынаўскіх перакладаў, друкарскіх і маст. асаблівасцей выданняў. На яго думку, «руская» (беларуская) мова Скарыны найб. выразна адчуваецца ў пражскіх кнігах. Праблему мовы Скарыны «ўзору беларускай гутаркі пачатку 16 ст». першы навукова паставіў Ф.Буслаеў. Падобнай думкі прытрымліваліся А.Аганоўскі, Уладзіміраў, М.Мурко, М.Драгаманаў, чэшскі філолаг І.Первольф, польскія вучоныя С.Ліндэ, М.Вішнеўскі, А.Брукнер, Л.Васілеўскі. За разнавіднасць польскай выдавалі мову Скарыны П.Кепен, В.Бадзянскі, Галавацкі. З поглядамі пра «рускі» (беларускі) характар скарынавых твораў не пагаджаўся А.Сабалеўскі, які лічыў яе царкоўнаславянскай. Значны ўклад у С. зрабіў Я.Ф.Карскі, які разгледзеў дзейнасць Скарыны на агульным фоне развіцця бел. культуры, мовы, асветніцтва. На мяжы 19—20 ст. і пазней у т.зв. нашаніўскі перыяд пачынаецца ўласна бел. С.: публікацыі А.Кіркора, М.Доўнар-Запольскага, А.Ельскага, А.Сапунова, І.Луцкевіча, А.Луцкевіча, В.Ластоўскага, Л.Гмырака, Р.Зямкевіча, пасля М.Гарэцкага, У.Ігнатоўскага, М.Янчука, М.Шчакаціхіна і інш. У 1921 выйшла філасофска-публіцыст. эсэ І.Абдзіраловіча (І.Канчэўскага) «Адвечным шляхам», у якім нац.-асветніцкі ідэал Скарыны прадстаўлены ўзорнай дамінантай на гіст.-цывілізацыйным шляху самабытна-творчага самасцвярджэння бел. супольнасці пры яе неадназначным геапаліт. становішчы паміж візант. Усходам і рыма-каталіцкім Захадам. У 1925 у Вільні выйшаў навук.-папулярны нарыс А.Станкевіча «Доктар Францішак Скарына — першы друкар беларускі», у 1926 у Коўне — манаграфія Ластоўскага «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі». На думку Ластоўскага, выдавецкую дзейнасць Скарыны падтрымлівалі віленскае і полацкае купецтва, кнігі друкаваліся «па магчымасці на зразумелай народу мове», усталёўвалі «жыццёвую мудрасць» — ідэі патрыятызму, маральнага ўдасканалення, спрыялі развіццю свецкіх навук. На яго думку, процідзеянне Скарыне аказвала правасл. і каталіцкае духавенства, што ў значнай меры паслужыла і прычынай спынення яго друкарскай дзейнасці. Усе манаграмы і крыптанімы ў пражскіх і віленскіх выданнях Скарыны даследчык прыпісваў мясц. майстрам-«русінам». З нагоды 400-гадовага юбілею віленскіх выданняў Скарыны ў 1926 у Мінску выдадзены навук. зб. артыкулаў бел. даследчыкаў «Чатырохсотлецце беларускага друку, 1525—1925» (аўтары І.Воўк-Левановіч, В.Дружчыц, М.Любаўскі, У.Перцаў, У.Пічэта, М.Піятуховіч, Шчакаціхін, Дз.Ягораў, А.Ясінскі). Гал. яго тэмы: умовы развіцця ВКЛ, Чэхіі, Італіі і гісторыя бел. кірылічнага кнігадрукавання ў 16—17 ст., Адраджэнне на Беларусі, літ. дзейнасць і мова выданняў Скарыны. Навук. узроўнем вылучаліся артыкулы Пічэты «Скарыніяна» і Шчакаціхіна «Гравюры і кніжныя аздобы ў выданнях Францыска Скарыны», дзе ўпершыню сістэматызаваны мастацка-стылявыя рысы 45 гравюр з выданняў Скарыны. Шчакаціхін паставіў таксама пытанне пра дату выхаду «Малой падарожнай кніжкі». На яго погляд, яна надрукавана ў Вільні каля 1530. М.В. Доўнар-Запольскі працэс станаўлення бел. кнігадрукавання разглядаў у непарыўнай сувязі з «вял. гаспадарчай перабудовай» як у Зах. свеце, так і ў Літоўска-Беларускай дзяржаве. Пічэта, разглядаючы творчасць Скарыны як з'яву рэнесансавай культуры, упершыню ў навук. плане паставіў пытанне пра бел. Адраджэнне. У канцы 1920-х — 1930-я г. навук. даследаванне творчасці Скарыны амаль поўнасцю спынілася.

У 1958 М.А.Алексютовіч у манаграфіі «Скарына, яго дзейнасць і светапогляд» разгледзеў асн. праблемы сац.-эканам. і культ. развіцця Беларусі ў 1-й пал. 16 ст., жыццё і дзейнасць Скарыны, яго сац. і культ.-асветныя, гуманістычныя погляды, уплыў яго творчай спадчыны на развіццё ўсх.-слав. пісьменства. У пач. 1960-х г. у сувязі з 400-годдзем рус. кнігадрукавання да вывучэння «пражскага ўрока» звярнуўся рас. мастацтвазнавец А.А.Сідараў. Літоўскі гісторык Л.І.Уладзіміраў лічыў, што фарміраванне бел. кнігадрукавання абумоўлена развіццём духоўнай культуры ВКЛ, патрэбамі мяшчан, шляхты, дзярж. органаў, каталіцкай і правасл. царквы. Ён выказаў гіпатэтычнае меркаванне, што папярэднікам Скарыны быў малавядомы лонданскі кнігавыдавец канца 15 ст. Дж. Літвін. Бел. літ.-знавец А.Ф.Коршунаў у 1969 выдаў прадмовы і пасляслоўі Скарыны (перавыдадзена з дапаўненнямі ў 1990), мастацтвазнавец Л.Баразна падрыхтаваў альбом гравюр Скарыны з гіст.-мастацтвазнаўчым экскурсам (1972, 2-е выд. 1990). Праблемы маст. афармлення кніг Скарыны ў рэчышчы еўрап. і ўласна бел. традыцый узняты ў манаграфіях бел. мастацтвазнаўца В.Ф.Шматава «Беларуская кніжная гравюра XVI—XVIII стст.» (1984) і «Мастацтва кнігі Францыска Скарыны» (1990). Ён прапанаваў новую маст.-стылістычную класіфікацыю пражскіх гравюр і інш. кампанентаў афармлення выданняў Скарыны (ініцыялы, застаўкі, канцоўкі, наборны арнамент,

паліграф. арганізацыя тэксту); абгрунтаваў іх маст. асаблівасці ў параўнанні з зах.-еўрап. і ўласна бел. выяўл. традыцыямі. У шматлікіх публікацыях прааналізаваны тыпалагічныя асаблівасці выданняў Скарыны, іх тыпаграфіка, гіст. лёс, этапы развіцця С. Кнігазнаўчае апісанне большасці кніг Скарыны з асвятленнем іх паходжання, уладальнікаў, маргінальных запісаў і інш. далі Я.Л.Неміроўскі, В.І.Лук'яненка, Ю.А.Лабынцаў, І.В.Паздзеева, Г.Я.Галенчанка. Апісанне ўсіх пражскіх экзэмпляраў (без пазней знойдзенага канвалюта, набытага Лонданскай б-кай імя Скарыны) з поўным падборам факсімільных рэпрадукцый гравюр і арнаментыкі змешчана ў 8-томным апісанні кірылічных выданняў, падрыхтаванага Неміроўскім у рамках агульнаеўрап. праекта даследавання слав. кірылічнай кнігі («Зводны каталог старадрукаў кірылаўскага шрыфту». Бадэн-Бадэн, 1998. Т.3). Выданні Скарыны ў рэтраспектыве ўсяго бел. кірылічнага кнігадрукавання 16—18 ст. апісаў Галенчанка ў зводным каталогу «Кніга Беларусі, 1517—1917» (1986). У 1990—91 выд-ва «Беларуская Энцыклапедыя» апубл. выданне факсімільнага тыпу, куды ўвайшла пражская Біблія Скарыны 1517—19 (складанне і навук. падрыхтоўка Галенчанкі, прадмова А.Л.Петрашкевіча). «Слоўнік мовы Скарыны (т. 1—3, 1977—94) выдаў У.В.Анічэнка. У 1991 фрагменты «Малой падарожнай кніжкі» апубл. Лабынцаў у выданні «Зерцало жития...»: З літаратурнай спадчыны Францыска Скарыны», У.Г.Кароткі — «Прадмовы і паслясловы паслядоўнікаў Скарыны». Вынікі шматгадовых даследаванняў падсумаваны ў працы Неміроўскага «Францыск Скарына: Жыццё і дзейнасць беларускага асветніка» (1990). У манаграфіі Галенчанкі «Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар» (1993) асн. ўвага звернута на асвятленне грамадска-паліт. і культ. фактараў узнікнення бел. кнігадрукавання, выяўленне этнасац. і дзярж.-геагр. арэала пашырэння яго кніг, уздзеянне творчай спадчыны Скарыны на выдавецкую дзейнасць яго пераемнікаў (Буднага, В.Цяпінскага, брацкіх кнігавыдаўцоў і інш.). Паглыблены прафесіяналізм, дыферэнцыяцыя і рознабаковасць прац па С. 1960—90-х г. сведчылі пра фарміраванне адпаведных гіст.-культ., лінгвістычна-філас., літ.-знаўчай, кнігазнаўчай, гіст.-маст. школ ці тэматычных кірункаў. Агульны гіст. фон, філас., грамадска-паліт., этычныя, эстэтычныя погляды Скарыны, рэнесансава-гуманістычныя, дэмакр. тэндэнцыі ў яго творчасці разгледжаны ў «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. 1, 1968). Дзейнасць Скарыны на фоне паліт., сац.-эканам. і культ. развіцця ВКЛ, яе міжнар. аспекты даследаваны ў зб. «Скарына і яго эпоха» (1990), у публікацыях В.К.Зайцава, В.У.Чапко, А.П.Грыцкевіча, У.М.Конана, С.А.Падокшына. Падокшын у манаграфіі «Францыск Скарына» (1981) даследаваў гнасеалагічныя, анталагічныя, сац.-паліт., эстэтычныя погляды Скарыны, падкрэсліў некананічнасць яго біблейскіх перакладаў. Філасофскія, этычныя, грамадска-паліт. погляды Скарыны і яго паслядоўнікаў разгледжаны ў манаграфіях Падокшына «Скарына і Будны: Нарыс філасофскіх поглядаў» (1974) і «Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага» (1990). Літ., перакладчыцкай і пісьменніцкай дзейнасці Скарыны з выкарыстаннем новых матэрыялаў прысвечаны даследаванні Лабынцава «Пачатае Скарынам» (1990) і «Зерцало жития...», працы В.А.Чамярыцкага, А.В.Мальдзіса, М.М.Грынчыка, А.А.Лойкі. Значэнне скарынаўскіх ідэй і яго творчасці ў новай бел. л-ры канца 19 — пач. 20 ст. раскрыта ў кн. А.К.Каўкі «Тут мой народ» (1989). Своеасабліва інтэрпрэтуе спадчыну Скарыны ў рэчышчы ўсх.-слав. Адраджэння А.А.Яскевіч у кн. «Творы Ф.Скарыны: Жанравая структура. Філасофскія погляды. Мастацтва слова» (1995). Моўнае наватарства, бел. і кніжнаслав. рысы тэкстаў і перакладаў Скарыны і яго паслядоўнікаў характарызуюцца ў працы А.І.Жураўскага «Гісторыя беларускай літаратурнай мовы» (т. 1. 1967). калектыўнай працы А.М.Булыкі, Жураўскага, У.М.Свяжынскага «Мова выданняў Францыска Скарыны» (1990), у даследаваннях Анічэнкі, А.Я.Баханькова, А.А.Парукава, Л.М.Шакуна і інш. Творчасць Скарыны як пачынальніка арыгінальнага бел. вершаскладання, яго гімнаграфічныя творы даследуюцца ў працах В.Тумаша, А.А.Турылава, Грынчыка, Яскевіч, у манаграфіі І.В.Саверчанкі «Старажытная паэзія Беларусі, XVI — першая палова XVII ст.» (1992), кн. Лойкі «Старабеларуская літаратура» (2001). Свае падыходы да біяграфіі і творчасці Скарыны выклаў У.У.Агіевіч у працы «Сімволіка гравюры Скарыны» (1999). Новы ўзровень С. ў канцы 1980—90-х г. звязаны з дзейнасцю АН Беларусі, дзе распрацоўвалася юбілейная праграма скарыназнаўчых даследаванняў, а таксама выд-ваў «Навука і тэхніка» (з 1996 «Беларуская навука») і «Беларуская Энцыклапедыя». У 1991 створаны Навукова-асветны цэнтр імя Скарыны, які таксама распачаў даследаванні па С. Распрацоўкай праблем С., выяўленнем новых крыніц займаліся бел., рас., укр. даследчыкі: В.І.Дарашкевіч, В.Н.Дышыневіч, Я.Дз.Ісаевіч, Г.П.Лебедзеў, А.С.Мыльнікаў, М.В.Нікалаеў, В.Р.Пуцко, Шакун, С.Шупа і інш. Вял. матэрыял абагульнены і сістэматызаваны ў фундаментальным юбілейным энцыклапедычным даведніку «Францыск Скарына і яго час» (1988).

Да 500-годдзя з дня нараджэння Скарыны выдадзены навук.-тэматычныя зб-кі і навук.-папулярныя і літ. творы У.А.Калесніка, Каўкі, Лойкі, А.К.Клышкі, Петрашкевіча і інш. Для замежных чытачоў па заказе ЮНЕСКА Галенчанка, Чамярыцкі і Шматаў апубл. ў Парыжы навук.-папулярную кн. «Францыск Скарына» (у 1979 на франц., у 1980 на англ. мовах). Паводле пастановы ЮНЕСКА 1990 год быў аб'яўлены годам Скарыны. Скарынаўскія чытанні і навук. канферэнцыі прайшлі ў Мінску, Гомелі, Варшаве, Празе, Вільнюсе, Маскве, Лондане, Падуі (1986—92). Важкі ўклад у С. (пераважна ў даследаванне крыніцазнаўчых аспектаў выдавецкай дзейнасці і творчасці Скарыны і яго біяграфіі) замежных гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў, філолагаў (Ю.Віцьбіч, Л.Гарошка, Р.Жук-Грышкевіч, Я.Запруднік, А.Калубовіч, В.Пануцэвіч, Я.Пятроўскі, В.Кіпель, С.Станкевіч, Я.Станкевіч, П.Татарыновіч, П.Урбан і інш.). Адным з цэнтраў славяназнаўчых даследаванняў у 1920—30-я г. была Прага. У 1926 у Пражскім ун-це абараніў дысертацыю «Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве» І.С.Дварчанін. Гэта было 1-е ў бел. літ.-знаўстве даследаванне пра Скарыну, яго светапогляд, культ.-гуманіст. і патрыят. дзейнасць (у пер. на бел. мову апубл. ў 1991). Этапнымі ў С. былі публікацыі рус. гісторыка-славіста, выкладчыка Карлава ун-та ў Празе, А.Ф.Фларовскага, які даследаваў пытанні, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Скарыны ў Чэхіі. У артыкулах і ў яго манаграфіі «Чэшская біблія ў гісторыі рускай культуры і пісьменнасці: Францыск Скарына і прадаўжальнікі яго справы» (1940—46) прыведзены невядомыя раней факты з біяграфіі Скарыны. На думку даследчыка, Скарына заснаваў сваю друкарню ў Празе, дзе быў высокі ўзровень кнігадрукавання і меліся сувязі з ням. і італьян. выд-вамі. Ён прааналізаваў суадносіны чэшскай Біблії 1506 і Біблії Скарыны, высвятляў уздзеянне творчасці Скарыны на бел., рус. і ўкр. рукапісную кніжнасць 16—17 ст. Традыцыі чэшскага С. працягваюць П.Р.Покарні, Ф.Сокалава і інш. Цікавасць у гіст.-параўнальным і бібліягр. аспектах мае шматтомнае выданне «Друкары старажытнай Польшчы XV—XVIII ст.», 5-ы выпуск якога прысвечаны ВКЛ (1959). Дзейнасць Скарыны асвятляецца ў абагульняльных працах польскай даследчыцы М.Б.Тапольскай па гісторыі кніжнай культуры ВКЛ. Супрацоўнік Нац. музея ў Варшаве В.Дэлюга выявіў сувязі некат. пражскіх гравюр Скарыны з папярэднімі чэшскімі, ням., пражскімі друкаванымі яўр. выданнямі 15 — пач. 16 ст. Асобныя пытанні С. з акад. пазіцый рэгулярна асвятляліся ў лонданскім час. «The Journal of Byelorussian Studies» («Часопіс беларускіх даследаванняў»), у час. «Запісы» Бел. ін-та навукі і мастацтва ў ЗША. Большую ч. 5-й юбілейнай кн. «Запісаў» (1970), якую падрыхтаваў Тумаш (Сымон Брага) складае храналагічна-бібліягр. агляд прац пра Скарыну. Ён аўтар артыкулаў «Геаграфічная лакалізацыя жыццяпісу доктара Скары-

ны», «Пытанне імя доктара Скарыны», «Канфіската ў Вроцлаве кнігаў Бібліі Скарыны», «Кнігі Скарыны на захадзе Еўропы ў пару ягонную й сёння». У артыкуле, прысвечаным «Малой падарожнай кніжцы» («Запісы». 1978. Кн. 16), ён даказаў, што 2 дрэварыты нюрнбергскай друкарні канца 15 ст. выкарыстоўваліся Скарынаю ў Вільні. Унікальны дацкі экзэмпляр «Малой падарожнай кніжкі» з захаванай пасхаліяй у 1971 апісаў А.Надсон, што дазволіла датаваць яе 1522 ці 1523. У манаграфіі бел. віленскага даследчыка Х.Ільяшэвіча «Друкарня дома Мамонічаў у Вільні (1575—1622)» (1938) зроблена спроба высветліць выключную ролю сталіцы ВКЛ у пашырэнні друкарскай справы на «ўсходзе», уплыў дзейнасці Скарыны на станаўленне бел., рус. і ўкр. кнігадрукавання ў 16—18 ст. Змястоўныя зб-кі прац вільнюскіх навук. канферэнцый, прысвечаных Скарыне, апубл. ў 1979, 1987, 1991.

Этапы паслядоўнага развіцця С. ў сінт. форме адлюстраваны ў спец. абагульняльных працах — «Скарыніянах». Аўтарам 1-й «Скарыніяны», прызначанай для выдання «Чатырохсотлецце беларускага друку, 1525 — 1925» (1926) быў Пічэта. У яго аглядзе ўлічаны асн. выданні актаў (акрамя М.Круповіча), бібліягр. апісанні Бакмейсцера, Штрытэра, Аляксеева, Сопікава, Каратаева, П.М.Строева, прааналізаваны біягр. звесткі, выдавецкая, літ., перакладчыцкая дзейнасць, маст. асаблівасці выданняў, грамадскія погляды, уплыў спадчыны Скарыны на яго паслядоўнікаў, развіццё бел. і ўсх.-слав. культуры. З 1926 і да сярэдзіны 1960-х г. С. даследаваў А.В.Фларoўскі, у т.л. ў яго фундаментальнай працы «Чэшская біблія ў гісторыі рускай культуры і пісьменнасці» і новых матэрыялах пра Скарыну (дакументы 2-га пражскага перыяду і інш.). Гістарыяграфічныя працы Пічэты і Фларoўскага значна дапоўнены даслёваннямі М.Б.Батвінніка, Дышыневіч, Каўкі, У.М.Казберука. Замежнае С. канца 1940—70-х г. разгледжана ў публікацыі Я.Садоўскага «Скарыназнаўства на Захадзе пасля другой сусветнай вайны» (1983). Пазнейшыя агляды С. рабілі Неміроўскі, Галенчанка, аўтары артыкулаў у пражскім зб. «Францыск Скарына ў працах чэшскіх славістаў» (1992). Нямала каштоўных гістарыяграфічных аглядаў, рэцэнзій апубл. ў перыяд. выданнях, матэрыялах Скарынаўскіх чытанняў, зб-ках «Беларусіка», «Скарыніч», «Шляхам гадоў» і інш.

Сістэматызацыі даследаванняў па С. спрыялі рэтраспектыўныя бібліягр. паказальнікі галіновай і бягучай бібліяграфіі. 2 рэтраспектыўныя паказальнікі склаў Тумаш (1970, 1989), па аналагічнай схеме — Неміроўскі (1978); найб. поўны паказальнік да юбілею Скарыны склалі Неміроўскі і Л.А.Осіпчык (1990). Гісторыя біягр. і кнігазнаўчага вывучэння выданняў Скарыны адлюстравана ў тэматычна-храналагічным паказальніку Галенчанкі (1993).

Асобны раздзел С. стварае публікацыя і вывучэнне дакументальных крыніц, гіст. дакументаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю Скарыны. Звесткі пра дакументальныя матэрыялы сустракаюцца ва ўсіх аглядах С. (працы Уладзіміравa, Пічэты, Фларoўскага, Алексютовіча і інш.). Большасць актаў апубл. ў даследаваннях або розных зб-ках і перыяд. выданнях. Агульны іх спіс з тлумачэннямі змешчаны ў 5-й кнізе «Запісаў» (1970). Дарашкевіч падрыхтаваў 1-е зводнае выданне дакументаў і матэрыялаў «Францыск Скарына: Зборнік дакументаў і матэрыялаў» (1988, уключана 55 актаў і вытрымак з дакументаў).

Матрыкуляцыйны спіс Кракаўскага ун-та 1504 выявіў С.Пташыцкі, прамацыйны акт 1506 (пра экзамены на вучоную ступень бакалаўра філасофіі) — А.С.Петрушэвіч, экзаменацыйныя запісы Падуанскага ун-та 1512 (пра наданне ступені ў «лекарскіх науках» доктара) — С.Віндакевіч, пратакол падуанскай курыі 9.11.1512 — Садоўскі. Некалькі дакументаў, звязаных са знаходжаннем Скарыны ў 1530 у Кёнігсбергу абнародаваны А.І.Мілавідавым. Шэраг дакументаў пражскага перыяду дзейнасці Скарыны выявіў Фларoўскі.

Матэрыялы судовых працэсаў па маёмасных справах 1520 — сярэдзіны 1530-х г., у т.л., віленскія і полацкія акты 1529 і 1535, увёў ва ўжытак Уладзіміраў, пазнанскія — М.Вайцяхоўская і Дарашкевіч; 2 каралеўскія прывілеі Скарыну — Круповіч. Значную колькасць дакументаў, што, на думку даследчыкаў, датычацца Скарыны, але не ўпамінаюць яго імя, у іх ліку імянны склад віленскай рады, каралеўскі прывілей 1532, прадстаўлены ў пазнанскі магістрат Скарынай, адшукаў Галенчанка. Найб. значныя поспехі С. ў біяграфічных, кнігазнаўчых, літ.-знаўчых і моваznаўчых даследаваннях, у вывучэнні светапогляду Скарыны.

Літ.: Ботвинник М.Б. Изучение жизни и деятельности Франциска Скорины в БССР // Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. М., 1979; Яго ж. Историография изучения «Малой подорожной книжки» и «Апостола» Ф.Скорины // Франциск Скорина — белорусский гуманист, просветитель, первопечатник. Мн., 1989; Яго ж. Вывучэнне жыцця і дзейнасці Францыска Скарыны ў ЗША // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1990. № 4—5; Яго ж. Навука і невуцтва: Скарыназнаўства ў Акадэміі навук БССР і ў Польшчы (1928 — 1941) // Полымя. 2000. №12; Дышиневич В.Н. Скориноведение: некоторые вопросы историогр. и библиогр. // Книга в Белоруссии: Книговедение, источники, библиогр. Мн., 1983. Вып. 2; Чамярыцкі В.А. Скарыназнаўства на сучасным этапе // Славяне: адзінства і мнагастайнасць. Вып. 3. Гуманізм і асветніцтва ў славянскіх культурах. Мн., 1990; Франциск Скорина в белорусском советском обществоведении. Мн., 1987; Неміроўскі Я.Л. Скарыназнаўства // Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед. Мн., 1988; Каўка А.К. Беларускае скарыназнаўства ў 20-я гг. XX ст. // Кніжная культура Беларусі. Мн., 1991; Судавичене Л.В. Литовская скориниана // Франциск Скорина и Вильнюс. Вильнюс, 1991; Шматаў В. Нататкі мастацтвазнаўчай Скарыніяны // Культура беларускага замежжа. Мн., 1993. Кн. 1; Сокалава Ф. Вывучэнне жыцця і дзейнасці Ф.Скарыны чэшскімі даследчыкамі: Пер. з чэш. // Беларуcіка=Albaruthenica. Мн., 1993. Кн. 1; Галенчанка Г. Праблемныя дакументы Скарыніяны ў кантэксце рэальнай крытыкі // Там жа. Мн., 1998. Кн. 9; Шалькевич В.Ф. Скорина и скориниана. Мн., 2001; Тумаш В. Пяць стагоддзяў Скарыніяны, XVI — XX: [Бібліягр.]. Нью-Ёрк, 1989; Открытие Скорины: Библиогр. указ. книговедческих и библиогр. описаний изд. Ф.Скорины, его книг, представленных в собраниях XVI — XX вв., обзоров Скоринианы / Сост. Г.Я.Голенченко. Мн., 1989; Францыск Скарына: Жыццё і дзейнасць: Паказ. літ. [1539—1989] / Склад. Я.Л.Неміроўскі, Л.А.Осіпчык. Мн., 1990; Францыск Скарына: Жыццё і дзейнасць: Паказ. літ.: Дад. за 1530—1988 гг., 1989—1993 гг. / Склад. В.Грышкевіч, Л.Юрэвіч. Мн., 1995; Sadoŭski J. Studies on doktor Francis Skaryna in the West since World War II // Запісы Бел. ін-та навукі і мастацтва. 1983. Кн. 17; Francisco Skoryna v díle českych slavistů. Praha, 1992; Nemirowskij E. Die Prager Druckerei von Francisk Skorina (1517—1519) // Gesamtkatalog der Frühdruck in kyrilischer Schrift. Baden-Baden, 1998. Bd. 3. Гл. таксама да арт. *Скарына Ф. Г.Я.Галенчанка, А.К.Каўка.*

«СКАРЫ́НІЧ», літаратурна-навуковае выданне. Выйшлі 4 зборнікі (1-ы — Мн., 1991; 2-і — Мн., 1993; 3-і — М., Мн., Смаленск, 1997; 4-ы — Мн., 1999) на бел. мове, частка тэкстаў — на рускай. Укладальнік А.К.*Каўка*. Асн. тэма зборнікаў — спадчына Ф.*Скарыны* і праблемы яе вывучэння, а таксама асэнсаванне творчасці літ. згуртавання 1920-х г. «Узвышша». У зборніках змешчаны невядомыя раней архіўныя дакументы, рукапісныя матэрыялы М.Улашчыка, Я.Лёсіка, А.Смоліча, І.Луцкевіча, А.Бабарэкі, Я.Варонкі, Я.Дылы і інш., рэдкія фотаздымкі, хроніка дзейнасці Маскоўскага т-ва бел. культуры імя Ф.Скарыны.

Літ.: Хто ёсць Хто сярод беларусаў свету: Энцыкл. давед. Ч. І. Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў памежных краінах. Мн., 2000. С. 110—111. *Г.Г.Сяргеева.*

СКАРЫ́НКІН Андрэй Уладзіміравіч (н. 20.12.1962, Мінск), бел. паэт. Сын У.М.*Скарынкіна*. Скончыў БДУ (1994), Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1997). У 1999—2001 у Ін-це парламентарызму і прадпрымальніцтва ў Мінску. Друкуецца з 1980. Піша на рус. мове. У паэт. зб-ках «Начны спявак», «Барвяныя прыцемкі» (абодва 1994), «Сухія кветкі» (1995), «Журботны госць» (1997) і інш. роздум над лёсам рус. свету, чалавецтва, сэнсам жыцця. Многія вершы С. пакладзены на музыку. Пераклаў на рус. мову вершы А.Звонака.

Тв.: Соврасиана: Роман в стихах. М., 1995; Полет над блудницей: Новелла в стихах. М., 1996; Король Парнаса. М., 1998; Золотая паутина. Мн., 1999; Via dolorosa. М., 2000; Альфа и омега. М., 2001; Плач журавлей. Мн., 2001; Родничок. Мн., 2001.

СКАРЫ́НКІН Іван Яфімавіч (26.11.1919, в. Тратны Вугал Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. пісьменнік. Скон-

чыў Ваенна-паліт. акадэмію імя Леніна ў Маскве (1952). У 1939—71 служыў у Сав. Арміі (з 1958 у газ. «Во славу Родины»), у 1972 — 85 у выд-ве «Беларусь». Друкуецца з 1950. Піша на рус. мове. Аўтар кніг нарысаў «Завешчана бацькамі» (1974), і «Пра што шумяць сосны» (1980), «Залатая карона» з Клімавічаў» (1998), дакумент. аповесцей «Мацней за сталь» (1978), «Тугія вятры» (1983), «У смузе палігоннай» (1984), аповесці «Права весці ў бой» (1980). Асн. тэматыка яго творчасці — мужнасць і гераізм у гады Вял. Айч. вайны, мірныя будні воінаў.

Тв.: Резерв комбата: Док. повести. Мн., 1988; Гибель маршала в Кремле. Мн., 1999.

У.М.Скарынкін.

СКАРЫ́НКІН Уладзімір Максімавіч (н. 7.6.1939, г. Віцебск), бел. паэт і перакладчык. Скончыў Рыжскі ін-т інжынераў грамадз. авіяцыі (1961). З 1961 працаваў у Мінскім аэрапорце, з 1970 у Бел. упраўленні грамадз. авіяцыі, у 1982—87 і 1992—99 у Саюзе бел. пісьменнікаў. Друкуецца з 1955. Першы зб. вершаў «Буслы над аэрадромам» (1969). Аўтар вянка санетаў «Вачэй тваіх паляны» (1980), паэм «Дарога ў неба» (1970), «Насустрач веку» (1971), «Сляпы дождж» (1974), «Высокае сонца» (1976), «Узнясенне» (1983), «Астральны знак Скарыны» (1986). Асн. тэмы яго твораў — маленства, апаленае вайной, любоў да роднай зямлі, яе гісторыі, роздум над складанымі праблемамі сучаснасці, пытанні духоўнасці. Піша для дзяцей (кнігі вершаў, скорагаворак і казак «Канікулярная ангіна», 1991; «Падарожжа ў Крайшарад», 1997; фантаст.-прыгодніцкія апавяданні «У карэце па белым свеце», 2000). На бел. мову пераклаў зб-кі вершаў М.Рубцова «Рускі агеньчык» (1986), М.Вінграноўскага «Украінскі прэлюд» (1999), паэму Дантэ «Боская камедыя» (1997, Нац. прэмія Італіі 1998; Дзярж. прэмія Беларусі імя Я.Купалы 2000), паэму Дж. Байрана «Прароцтва Дантэ».

Тв.: Гукавы бар'ер. Мн., 1972; Дазвольце ўзлёт. Мн., 1975; Чацвёрты разварот. Мн., 1979; Вугал атакі. Мн., 1983; Пасадачныя агні. Мн., 1985; Выратавальны плыт. Мн., 1988; Размова на парозе. Мн., 1991; Лосвіда. Мн., 1993; Апошняе слова. Мн., 1994.

І.У.Саламевіч.

СКАРЫ́НЫ ПРАСПЕ́КТ у Мінску, гал. дыяметр і асноўная магістраль горада; перасякае яго з ПдЗ на ПнУ. З 1951 наз. Сталінскі, з 1961 Ленінскі праспект, з 1990 сучасная назва. Даўж. больш за 11 км, шыр. 48—70 м. Як гал. кампазіцыйны дыяметр арганізацыйна ўплывае на планіроўку і забудову ўсяго горада. Яго перасякаюць Мінскі водназлёны дыяметр р. Свіслач і важныя трансп. магістралі, якія звязваюць праспект з усімі раёнамі горада. Уздоўж праспекта размяшчаюцца асн. гар. плошчы — *Перамогі плошча*, Кастрычніцкая, Я.Коласа. Чаргаванне адм. будынкаў, культ.-асв., навучальных, гандл., вытв. і інш. устаноў з жылымі дамамі і комплексамі зрабіла магчымым пазбегнуць аднастайнасці і стварыць яго своеасаблівае арх.-маст. аблічча. Як гал. гар. магістраль пачаў фарміравацца ў 19 ст. Забудоўваўся праспект у 3 чаргі: 1-ы ўчастак (цэнтральны) ад *Незалежнасці плошчы* да пл. Перамогі (2,9 км, з 1945 пад кіраўніцтвам М.Баршча і М.Паруснікава) створаны на месцы вул. Савецкай (з 1830 вул. Захар'еўская, у 1918—19 — Адама Міцкевіча), Пушкінскай (назва ў 1920—44 участка ад вул. Даўгабродскай да будынка абсерваторыі); 2-і — ад пл. Перамогі да пл. Калініна (2,7 км) і 3-і — ад пл. Калініна да ўезда ў горад з боку Маскоўскай шашы (больш за 6 км, 1950—70-я г.). Пасля Вял. Айч. вайны гал. магістраль створана на шырокай і выпрастанай трасе. На цэнтр. участку створаны ансамблі высокай арх.-маст. вартасці, характар арх. афармлення якіх засн. на творчым асваенні класічнай спадчыны: адм. будынкі паміж вул. Гарадскі Вал і Камсамольскай (КДБ; 1945—47, арх. Г.Гай, Паруснікаў), *Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, Мінскага гарадскога універмага, Мінскага галоўнага паштамта, Рэспубліканскага Палаца культуры прафсаюзаў, Мінскага цырка,* будынак б. *Мінскага царкоўна-археалагічнага музея,* гасцініца «Мінск» (1-я чарга ў 1957, арх. Г.Баданаў, 2-я — у 1967, арх. Г.Сысоеў, С.Мусінскі, Дз.Кудраўцаў, з 2001 на рэканструкцыі). Ад вул. Я. Купалы праспект спускаецца да азяленай поймы Свіслачы, узвышаецца над масівамі паркаў імя Янкі Купалы і Цэнтр. дзіцячага парку імя М.Горкага. З гранітнай набярэжнай (1958, арх. К.Іваноў) адкрываецца панарама ў бок пл. Парыжскай камуны з манум. будынкам т-ра оперы і балета. За мостам (1951, арх. Паруснікаў, Баданаў) знаходзяцца 5-павярховыя жылыя дамы (1939, дабудаваны ў 1947, арх. Р. Столер, у 1950—56, арх. Баршч, Л. і Г.Аранаўскасы). Завяршае цэнтр. ўчастак праспекта пл. Перамогі з *Манументам Перамогі.* На 2-м участку праспекта побач з даваен. дамамі (1937—41, арх. А.Брэгман, Г.Якушка) узведзены новыя жылыя будынкі (1952—58, арх. Баршч, Л.Арнаўскас, А.Духан, С.Баткоўскі, Н.Макляцова, Н.Шпігельман). Вял. роля на гэтым участку і ў структуры горада належыць пл. Якуба Коласа з помнікам Я.Коласу ў цэнтры (1972, скульпт. З.Азгур, арх.

Скарыны праспект у Мінску. Фрагмент.

Скарыны праспект у Мінску. Фрагмент.

Ю.Градаў, Г.Заборскі, Л.Левін). Другі важны вузел участка ўтвараюць рэканструяваныя і расшыраныя комплексы 1-й клінічнай бальніцы, *Нацыянальнай акадэміі навук будынкі*, будынак *Беларускай політэхнічнай акадэміі*, кінатэатр «*Кастрычнік*», жылыя дамы з магазінам «1000 дробязей» (1962, арх. Сысоеў, Кудраўцаў), дом гандлю «Першамайскі» (б. «Сінтэтыка»; 1964—65, арх. Мусінскі, Сысоеў); завяршае ўчастак пл. Калініна з помнікам М.І.Кілініну (1978, арх. Ю.Грыгор'еў, А.Няўзораў, скульпт. В.Палійчук, І.Глебаў). 3-і ўчастак адрозніваецца ад папярэдніх аднабаковай забудовай на значнай адлегласці. Тут знаходзяцца будынкі гадзіннікавага з-да «Прамень» (1956—61, арх. Баткоўскі, І.Боўт, Шпігельман), кварталы жылых дамоў, Бел. агр. тэхн. ун-т (1956, арх. Бакланаў). Да праспекта прылягае парк імя Чэлюскінцаў, тэр. дзіцячай чыгункі (вакзал пабудаваны ў 1956) і зялёны масіў. Далей размешчаны кінастудыя «Беларусьфільм», жылыя дамы канца 1950-х г., *Мінскай гідраметэаралагічнай абсерваторыі будынак*, комплекс НДІ сродкаў аўтаматызацыі (1972, арх. Мусінскі, Кудраўцаў). Важная роля ў фарміраванні арх.-маст. аблічча праспекта належыць жылому раёну *Усход* (забудоўваецца з 1966). Уздоўж праспекта пабудавана 1-я чарга лініі *Мінскага метрапалітэна*. Архітэктарам Баданаву, Баршчу, Баткоўскаму, А.П.Воінаву, У.Каралю, Мусінскаму, Парушнікаву, Сысоеву, Н.Трахтэнбергу, Шпігельману прысуджана Дзярж. прэмія Беларусі 1968. *А.А.Воінаў, В.М.Чарнатаў.*

Панарама **Скарыны праспекта.**

СКАРЫФІКА́ЦЫЯ (ад лац. scarifico драпаю, надразаю) н а с е н н я, механічнае паверхневае пашкоджанне насення; прыём падрыхтоўкі яго да сяўбы. Ужываюць для насення бабовых траў, дрэвавых і кустовых пародаў, якія маюць цвёрдую, вільгаценепранікальную абалонку. Пасля С. насенне лепш убірае вільгаць, хутчэй набракае і прарастае. Праводзяць не раней як за 1 мес. перад сяўбой пераціраннем насення з пяском, жалезным пілавіннем і інш. Для прамысл. С. выкарыстоўваюць спец. машыны-скарыфікатары.

СКАСАВА́ННЕ ШЛЮ́БУ, гл. ў арт. *Шлюб*.

СКА́ТЫ (Batomorpha, або Batoidei), надатрад пласцінажабравых рыб. Вядомы з верхняй юры, шматлікія з верхняга мелу (каля 200—140 млн. г. назад). 5 атр.: піларылападобныя (*пілы-рыбы*), гнюсападобныя, або эл. С. (Torpediniformes), хвастаколападобныя (Dasyatiformes), ромбаскатападобныя (Rajiformes) і рохлепадобныя (Rhinobatiformes). 14 (16) сям., каля 50 родаў, 350 відаў. Пашыраны ў акіянах, трапляюцца на мелкаводдзі і да глыб. 2700 м, ёсць прэснаводныя (у бас. р. Амазонка і інш.). Прыдонныя рыбы, акрамя мантавых і хвастаколавых, якія жывуць у тоўшчы вады.

Даўж. ад некалькіх сантыметраў да 7 м, маса да 2,5 т. Цела плазаватае, шырокае, дыскаабо ромбападобнае. Скура голая або ўкрыта шыпамі. Зубы шыпападобныя ці пласкатыя, закругленыя. Жабравых адтулін 5, на брушным баку. Грудныя плаўнікі вял., іх краі зрошчаны з бакамі галавы і тулава. Спінныя плаўнікі на хвасце або адсутнічаюць. Хвастаколападобныя маюць калючыя хваставыя шыпы з яданоснай залозай, гнюсападобныя — эл. органы па баках цела. Бентафагі і драпежнікі. Жывародныя і яйцажывародныя; ромбаскатападобныя адкладваюць яйцы. Аб'екты промыслу. *А.М.Петрыкаў.*

Скаты: 1 — манта двухрогая; 2 — гнюс чорны; 3 — гладкі скат-матыль; 4 — хвастакол махрыстахвосты.

СКА́ЎТЫЗМ (ад англ. scout разведчык), сістэма арганізаванага пазашкольнага выхавання моладзі 7—21-гадовага ўзросту, якая ўключае развіццё іх грамадскай дзейнасці і фіз. падрыхтоўку. Першыя скаўцкія арг-цыі ўзніклі ў 1907 у Вялікабрытаніі (засн. Р.Бадэн-Поўэл),

пазней пашырыліся ў Францыі, Германіі, Італіі, ЗША і інш. краінах. Яны падзяляюцца на байскаўцкія (хлопчыкі) і гёрлскаўцкія (дзяўчынкі). У 1920 засн. Сусветная арг-цыя скаўцкага руху (World Organization of the Scout Movement, Жэнева), у пач. 1990-х г. у яе ўваходзіла больш за 16 млн. чл. з больш як 160 краін. У Рас. імперыі скаўцкія атрады ствараліся з 1909. У 1914 засн. т-ва «Рускі скаўт». Пасля 1917 скаўцкія арг-цыі забаронены, з пач. 1990-х г. пачалі аднаўляцца. На Беларусі дзейнічаюць дзіцячая грамадская арг-цыя «Бел. рэсп. скаўцкая асацыяцыя» (з 1991), рэсп. грамадская арг-цыя «Аб'яднанне бел. скаўтаў» (з 1992), грамадскае аб'яднанне «Беларускі скаўцкі рух» (з 1997). У 2001 у іх уваходзіла больш за 360 членаў.

СКАФА́НДР [франц. scaphandre ад грэч. skaphē лодка + anēr (andros) чалавек], індывідуальны герметычны рыштунак, які забяспечвае жыццядзейнасць і працаздольнасць чалавека ў неспрыяльных умовах. Адрозніваюць С. вентыляцыйныя (дыхальная сумесь паступае ад балонаў або кампрэсараў) і рэгенерацыйныя (выдыхальная сумесь ачышчаецца ад вуглякіслага газу, абагачаецца кіслародам і зноў паступае ў С.); касмічныя (аварыйна-выратавальныя і для выхаду ў адкрыты космас або на паверхню нябесных цел), вышынна-выратавальныя і вадалазныя.

Касм. С. (мяккі, паўжорсткі, жорсткі) прызначаны для работы па-за кабінай касм. карабля і на паверхні нябесных цел (напр., на Месяцы). Складаюцца з верхняга адзення, сілавой і герметычнай абалонкі, герметычнага шлема, вентылюючага і процітэорнага касцюма, сістэмы ахаладжэння. Вышынна-выратавальны С. выкарыстоўваюць пры парушэнні герметычнасці кабіны лятальнага апарата, катапультаванні на вял. вышыні і значнай скорасці палёту, у выпадку прыводнення. Маюць верхняе адзенне, шлем (з маскай або без яе), сістэму вентыляцыі (разамкнутую, замкнутую, рэгенерацыйную), цеплаахоўны касцюм, здымныя рукавіцы і абутак. Вадалазныя С. бываюць жорсткія (з металу), мяккія (метал. шлем і касцюм з прагумаванай тканіны) і лёгкія (гумавы шлем-маска і касцюм з тонкай прагумаванай тканіны). Гл. таксама *Гідракамбінезон*. *У.С.Ларыёнаў, У.М.Сацута.*

СКАЦЭ́ЦКІ Уладзімір Рыгоравіч (н. 18.4.1935, пас. Ратамка Мінскага р-на), бел. матэматык і педагог. Д-р пед. н. (1996), праф. (1997). Скончыў БДУ (1959), дзе і працуе. Навук. працы па тэорыі і методыцы выкладання матэматыкі на факультэтах нематэм. профілю. Аўтар вучэбных дапаможнікаў для ВНУ.

Тв.: Математическое моделирование физико-химических процессов. Мн., 1981; Профессиональная направленность преподавания математики: Теоретич. и практич. аспекты. Мн., 2000; Лекции по математике для студентов химических специальностей. Мн., 2000.

П.М.Бараноўскі.

СКАЧА́ЛЬСКАЕ ВО́ЗЕРА. У Старадарожскім р-не Мінскай вобл., у бас. р. Пціч, за 15 км на Пн ад г. Старыя Дарогі. Пл. 0,45 км², даўж. 900 м, найб. шыр. 670 м, даўж. берагавой лініі 2,5 км. Катлавіна рэшткавага тыпу, сярод балота. Схілы катлавіны невыразныя. Берагі сплавінныя, забалочаныя.



Паўжорсткі **скафандр** касманаўта арбітальнай станцыі «Салют-6» (без знешняй цеплаахоўнай абалонкі): 1 — мяккія часткі скафандра; 2 — карабін страхавочнага фала; 3 — раздым пнеўма- і гідракамунікацый; 4 — клапан уключэння рэзервовага кіслароду; 5 — ссоўны светлафільтр; 6 — жорсткі корпус; 7 — пульт кіравання і кантролю; 8 — рэгулятар рэжыму ціску ў скафандры; 9 — індыкатар ціску ў скафандры.

СКАЧКІ́ ЛЁГКААТЛЕТЫ́ЧНЫЯ, віды *лёгкай атлетыкі*, якія ўключаюць скачкі з разбегу ў вышыню, даўжыню, трайны скачок і скачкі з шастом. Скачкі ў выш., даўж. і з шастом уваходзяць у праграму лёгкаатлетычнага дзесяцібор'я (мужчыны); скачкі ў выш. і даўж. — сямібор'я (жанчыны). У праграмы спаборніцтваў С.л. ўключаны ў 1860-х г., у праграму Алімп. гульняў — у 1896. На Беларусі спаборніцтвы па С.л. праводзяцца з 1913 (г. Гомель, скачкі ў выш. і даўж. з месца). Чэмпіянаты Беларусі па лёгкай атлетыцы, у т.л. і па С.л., адбываюцца з 1924. Сярод бел. лёгкаатлетаў найб. вызначыліся: у трайным скачку — У.*Булатаў*, Г.*Валюкевіч*, У.Гараеў — сярэбраны прызёр XVII Алімп. гульняў (1960, Рым), А.Каваленка — бронз. прызёр, І.Лапшын — сярэбраны прызёр XXIV Алімп. гульняў (1988, Сеул).

СКАЧКІ́ НА БАТУ́ЦЕ, высокія падскокі на спарт. батуце з пераваротамі і вярчэннем; від спорту з элементамі акрабатыкі. Батут — плеценая сетка даўж. 3,6—4,3 м; шыр. 1,8—2,15 м, замацаваная на раме, выш. 0,95—1,05 м. Віды спаборніцтваў: індывід., па сінхронных скачках (2 спартсмены) і камандныя. Кожны від складаецца з абавязковай і адвольнай праграм, якія ўключаюць па 10 элементаў.

Да 1940-х г. выкарыстоўваліся як сродак трэніроўкі спартсменаў, пілотаў і парашутыстаў, уваходзілі ў цыркавыя праграмы. Спарт. спаборніцтвы праводзяцца з 1947 (ЗША). Міжнар. федэрацыя батута створана і праведзены 1-ы чэмпіянат свету ў 1964. Чэмпіянаты Еўропы праводзяцца з 1970. Найб. пашыраны ў Вялікабрытаніі, Германіі, ЗША, Швейцарыі.

Зборная каманда Беларусі — чэмпіён свету (1994). Мужчынская каманда — чэмпіён (1995) і сярэбраны прызёр (1996, 1998) чэмпіянатаў свету, чэмпіён Еўропы (1993). Жаночая каманда — сярэбраны прызёр чэмпіянату свету (1996), бронз. прызёр чэмпіянату Еўропы (1993). Сярод бел. спартсменаў найб. вызначыліся: у мужчын — чэмпіёны і прызёры чэмпіянатаў свету Я.Бяляеў, М.Казак, Дз.Паляруш, У.Какорка (у сінхронных выступленнях з Казаком); у жанчын — сярэбраныя прызёры чэмпіянату свету Т.Граеўская, Н.Карпянкова, Г.Лебедзева, Т.Чуміна (бронз. прызёр чэмпіянату свету, 1978) і Т.Мамай — чэмпіёнкі Еўропы ў індывід. (адпаведна 1974 і 1976) і сінхронных (1977) скачках, і інш. *А.М.Петрыкаў.*

СКАЧКІ́ НА ЛЫ́ЖАХ З ТРАМПЛІ́НА, від *лыжнага спорту*. Праводзяцца з трамплінаў з разліковай магутнасцю (аптымальная даўж. скачка) 20—50 м (малыя), 50—70 м (сярэднія), 70—90 м (вял.) і больш за 120 м (для палётаў на лыжах). Спаборніцтвы на Алімп. гульнях, чэмпіянатах свету і інш. праводзяцца на трамплінах магутнасцю 70 і 90 м; уваходзяць у праграму *лыжнага двайбор'я*.

Паходзяць з Нарвегіі. Першыя афіц. спаборніцтвы адбыліся ў 1897 паблізу Осла. У праграме Алімп. гульняў з 1924 (сярэдні трамплін) і з 1964 (вял.); чэмпіянаты свету з 1937 (з 1964 — на 2 трамплінах). Найб. пашыраны ў краінах Скандынавіі, Аўстрыі, Германіі, Расіі, Японіі і інш.

На Беларусі першыя спаборніцтвы адбыліся ў 1936. Чэмпіянаты рэспублікі праводзяцца з 1952, з 1962 — у праграме зімовых Спартакіяд. У міжнар. спаборніцтвах бел. спартсмены ўдзельнічаюць з 1961. Найб. вызначыліся чэмпіёны СССР У.Пальчэўскі (1961) і У.Церычаў (1972), Ю.Майсееў — чэмпіён І Усесаюзных зімовых сельскіх гульняў (1977), С.Баброў — чэмпіён Сусв. універсіяды (1999). На Беларусі 5 трамплінаў: 3 у в. Раўбічы Мінскага р-на (20, 40 і 60 м, усе са штучным пакрыццём), у г. Магілёў (30 м), у в. Белае Полацкага р-на Віцебскай вобл. (25 м).

А.М.Петрыкаў.

СКАЧКІ́ Ў ВАДУ́, спаборніцтвы сярод мужчын і жанчын па скачках з вышкі і трампліна ў ваду. Складаюцца з серый абавязковых і адвольных скачкоў з трампліна (выш. 1 і 3 м) і вышкі (5, 7,5 і 10 м). Існуюць 6 афіц. катэгорый скачкоў: з пярэдняй стойкі ўперад і назад, з задняй стойкі ўперад і назад, з вінтамі і са стойкі на руках (толькі з вышак). Скачкі ацэньваюцца па 10-бальнай шкале.

Як від спорту ўзніклі ў сярэдзіне 19 ст. ў Германіі. У праграме Алімп. гульняў з 1904 (мужчыны) і 1912 (жанчыны). 1-ы чэмпіянат Еўропы праведзены ў 1926, 1-ы чэмпіянат

свету — у 1973. Найб. пашыраны ў Германіі, ЗША, Італіі, Кітаі, Мексіцы, Расіі, Францыі, Швецыі і інш.

На Беларусі першыя афіц. спаборніцтвы праведзены ў 1935. Зборная каманда Беларусі — бронз. прызёр чэмпіянату СССР (1977); мужчынская зборная — сярэбраны прызёр Кубка Еўропы (1995). Сярод бел. спартсменаў найб. вызначыліся *У.Алейнік*, *А.Партноў*, С.Аляксеева — бронз. прызёр чэмпіянатаў Еўропы (1989, 1995); А.Касянкоў — бронз. прызёр XXI Алімп. гульняў (1976) і чэмпіянату Еўропы (1977); М.Міхайлін — сярэбраны прызёр чэмпіянату свету (1975); А.Семянюк — чэмпіён Еўропы (1991).

А.М.Петрыкаў.

СКАЧО́К у ф і л а с о ф і і, працэс змены ўнутранай сутнасці з'явы або прадмета; якаснае пераўтварэнне ў выніку колькасных змен. Характарызуецца карэнным пераломам ва ўзаемадзеянні *неперарыўнасці і перарыўнасці* з перавагай апошняй. Выступае ў якасці перадумовы карэнных якасных пераўтварэнняў, станаўлення якасна новых аб'ектаў, пастаяннага *руху* і *развіцця* свету. На стадыі С. вырашаюцца ўласцівыя прыродным і грамадскім з'явам унутр. супярэчнасці. Паводле спосабу здзяйснення адрозніваюць рэзкія і паступовыя С. Пры р э з к і х С. ранейшая якасць змяняецца новай хуткімі тэмпамі (пераўтварэнне элементарных частак у лабараторных умовах, напр., распад урану на свінец і галій), у грамадскім жыцці — сац. рэвалюцыі. Большасць пераходаў ад старой якасці да новай у прыродзе і грамадстве ажыццяўляецца шляхам п а с т у п о в ы х С. Узнікненне зорак і планет, антрапагенез, кліматычныя змены на Зямлі адбываліся паступова і паволі. У працэсе развіцця грамадства вызначаецца тэндэнцыя да паскарэння скачковых пераўтварэнняў сац. ладу. Гл. таксама *Пераход колькасных змяненняў у якасныя.*

В.І.Боўш.

СКАЧЫ́ЛЯС (Skoczylas) Уладзіслаў (4.4.1883, г. Вялічка Малапольскага ваяв., Польшча — 8.4.1934), польскі гравёр, адзін са стваральнікаў польскай графічнай школы 20 ст. Вучыўся ў Маст.-прамысл. школе ў Вене (з 1901) і АМ у Кракаве (1904—06). З 1908 выкладаў у Школе апрацоўкі дрэва ў Закапанэ, з 1922 праф. Школы прыгожых мастацтваў у Варшаве. Ініцыятар стварэння творчых аб'яднанняў «Рытм» (1922) і «Гравюра» («Рыт», 1925). Адзін з заснавальнікаў Ін-та прапаганды мастацтва. У творчасці выкарыстоўваў традыцыі нар. гравюры і лубка. Ксілаграфіі С. на сял. тэмы («Паход разбойнікаў», «Танец разбойнікаў», абедзве 1919; «Дзяўчаты з карзінамі», 1928), гар. і вясковыя пейзажы (цыкл «Старая Варшава», 1930) вылучаюцца дэкар. вытанчанасцю кампазіцыі, выразнасцю лінейнага рытму, святлоценявымі кантрастамі, фактурнымі і каларыстычнымі эфектамі.

СКАЧЫ́НСКІ Аляксандр Аляксандравіч [13.7.1874, г. Алёкмінск, Якуція (Рэспубліка Саха), Расія — 6.10.1960], расійскі вучоны ў галіне горнай справы. Акад. АН СССР (1935). Герой Сац. Працы (1954). Скончыў Пецярбургскі горны ін-т (1900), дзе і працаваў. З 1930 праф. Маскоўскага горнага ін-та, з 1938 дырэктар Ін-та горнай справы АН СССР. У 1944—51 старшыня прэзідыума Зах.-Сібірскага філіяла АН СССР. Навук. працы па праблемах рудніковай аэралогіі. Стварыў тэорыю руху паветра ў горных вырабатках, тэорыю проціпылавых аэрадынамічных рэжымаў. Распрацаваў метады даследавання сітаватасці і інш. уласцівасцей вугальных радовішчаў, вызначыў метананоснасць вуглёў. Дзярж. прэміі СССР 1950, 1951.

А.А.Скачынскі.

СКВАЙР (англ. squire), скарочаная форма англійскага дваранскага тытула *эсквайр.*

СКВАРЦО́Ў Сяргей Канстанцінавіч (20.1.1904, г. Луганск, Украіна — 4.2.1983), расійскі кінадзеяч, педагог. Засл. дз. маст. Беларусі (1967). Праф. (1955). Скончыў кінааддзяленне Вышэйшых дзярж. курсаў пры Ленінградскім тэатр. тэхнікуме (1930). Працаваў на кінастудыях СССР. У 1938—55, 1969—74 выкладчык, у 1955—62 заг. кафедры, 1974—83 кіраўнік майстэрні кінарэжысёраў Усесаюзнага дзярж. ін-та кінематаграфіі. У 1962—69 маст. кіраўнік творчага аб'яднання на кінастудыі «Беларусьфільм».

СКВАРЦО́Ў-СЦЯПА́НАЎ Іван Іванавіч (сапр. С к в а р ц о ў, літ. псеўд. Сцяпанаў; 8.3.1870, г. Багародск, цяпер Нагінск Маскоўскай вобл. — 8.10.1928), савецкі дзярж. і парт. дзеяч, публіцыст. Скончыў Маскоўскі настаўніцкі ін-т (1890). У рэв. руху з 1891, сацыял-дэмакрат з 1896, бальшавік з 1904, з 1921 чл. Цэнтр. рэвіз. камісіі ВКП(б), чл. ЦК ВКП(б) з 1925. Удзельнік рэвалюцый 1905—07 і Кастр. 1917. У грамадз. вайну кіраўнік выд-ва «Камуніст». У 1920 удзельнічаў у аднаўленні органаў сав. улады на Беларусі. З 1925 рэд. газ. «Известия», нам. рэд. «Правды», рэд. «Ленинградской правды». Адначасова з 1926 дырэктар Ін-та Леніна пры ЦК ВКП(б). Чл. ЦВК СССР. Аўтар прац па эканам., гіст., прыродазнаўчых і філас. пытаннях. Пераклаў на рус. мову «Капітал» К.Маркса.

Тв.: Избранное. М., 1970.

Літ.: К р у г л о в А.А. Скворцов-Степанов — атеист. Мн., 1974.

СКВА́ТЭРЫ (англ., адз. л. squatter ад squat самавольна пасяліцца на чужой зямлі), фермеры, якія ў 17—19 ст. самавольна, явачным парадкам захоплівалі незаселеныя землі ў брыт. калоніях Паўн. Амерыкі, а потым у ЗША (да 1862), Аўстраліі і некат. інш. краінах. Скватэрства было магчымае дзякуючы вял. фонду свабодных зямель і аднаснай слабасці мясц. адміністрацыі; адыграла важную ролю ў складванні там фермерскага, або прадпрымальніцкага, шляху развіцця сельскай гаспадаркі.

СКВЕР (ад англ. square квадрат), невялікі гарадскі *сад*; важная ч. *азелянення* населеных месцаў, дэкар. афармлення плошчаў і вуліц. Фарміруецца па асн. прынцыпах *садова-паркавага мастацтва.* Пл. звычайна 0,5—2 га. У адрозненне ад *бульвара* прызначаны пераважна для кароткачасовага адпачынку пешаходаў. С. можа мець самаст. закончаную кампазіцыю ці быць элементам буйнога арх.-ландшафтнага ансамбля. Звычайна асн. элемент кампазіцыі С. — пляцоўка для адпачынку з фантанам, дэкар. скульптурай, кветкавым партэрам, клумбамі, газонамі, пасадкамі дрэў, кустоў і інш. Першыя С. ўзніклі ў сярэдзіне 19 ст. ў Англіі, у 2-й пал. 19

Міхайлаўскі **сквер** у Мінску. Скульптура «Дама на лаўцы». Скульптар У.Жбанаў. 1998.

ст. — у Расіі. Першыя С. на Беларусі — Аляксандраўскі сад (1870, цяпер Цэнтральны С.) з фантанам (1874) і на Саборнай пл. (1890-я г., цяпер пл. Свабоды) у Мінску. Найб. значныя С. ствараюцца ў адм.-грамадскіх цэнтрах (на плошчах Незалежнасці ў Мінску, Леніна ў Магілёве, Савецкай у Гродне), каля трансп.-планіровачных вузлоў (на прывакзальных плошчах у Гомелі, Маладзечне; Міхайлаўскі каля чыг. вакзала ў Мінску), перад буйнымі грамадскімі будынкамі (каля Бел. муз. т-ра ў Мінску, політэхн. ін-та ў Брэсце), каля помнікаў і мемар. комплексаў (С. на пл. Перамогі ў Мінску, каля помніка Вызвалення на пл. Свабоды ў Брэсце), у квартальнай забудове — т.зв. С.-«кішэні» (па вул. Берсана, на скрыжаваннях вул. Варвашэні і Куйбышава ў Мінску) і інш. *Г.С.Ларкін.*

СКВОШ (англ. squash), ракетбол, спартыўная гульня з гумавым мячом (дыям. каля 4 см) і ракеткамі на прамавугольнай пляцоўцы (корце), абмежаванай сценкамі. Гуляюць двое або чацвёра (парамі). Мэта — падтрымліваць мяч у гульні і пры гэтым перашкаджаць дзеянням саперніка.

Узнік у сярэдзіне 19 ст. ў Вялікабрытаніі. Першыя клубы арганізаваны ў 1890-х г. Спаборніцтвы праводзяцца з 1920, чэмпіянаты свету — з 1930. Існуюць варыянты гульні: т.зв. «брытанскі» («мяккі», або «міжнародны») і «амерыканскі» («жорсткі», або хардбол). Найб. пашыраны ў некат. краінах Еўропы, Паўн. Амерыкі, Паўд.-Усх. Азіі, Афрыкі і інш.

СКЕ́ЙТБАРД, скейтборд (англ. skateboard ад to skate катацца + board дошка), 1) від спорту: катанне на адмысловай дошцы з ролікамі. 2) Сама такая дошка.

СКЕ́МА, паселішча эпохі неаліту, бронзавага і ранняга жал. вякоў каля в. Мікольцы Мядзельскага р-на Мінскай вобл., на берагавым узвышшы р. Скема. Першымі пасяленцамі былі носьбіты нарвенскай культуры (4-е—1-я пал. 3-га тыс. да н.э.), з сярэдзіны 3-га тыс. да н.э. сюды пранікла насельніцтва *тыповай грабеньчата-ямкавай керамікі культуры*. У больш позніх напластаваннях сустракаюцца матэрыялы *шнуравой керамікі культуры*. Да канца бронзавага і пач. ранняга жал. веку адносяцца знаходкі *штрыхаванай керамікі культуры* і *мілаградскай культуры*. Невял. рыбацкае паселішча існавала тут і ў сярэдневяковуі. Знойдзены рэшткі агнішчаў, паўзямлянак, сляды збудаванняў слупавой канструкцыі, кераміка. *М.М.Чарняўскі.*

СКЕНЕ́КТАДЫ (Schenectady), горад на ПнУ ЗША, на каналізаванай р. Мохак, штат Нью-Йорк. Засн. ў 1662. Каля 62 тыс. ж., з гарадамі Олбані, Трой і агульнымі прыгарадамі каля 900 тыс. ж. (1998). Вузел чыгунак і аўтадарог, рачны порт. Прам-сць: энергамашынабудаванне і эл.-тэхн. (вытв-сць турбін, турбагенератараў, атамных рэактараў, электраматораў і генератараў), хім., швейная. Ун-т (з 1795) з бат. садам. Цэнтр ядз. даследаванняў.

СКЕПТЫЦЫ́ЗМ (франц. scepticisme ад грэч. skeptikos які разглядае, даследуе), філасофская пазіцыя, якая характарызуецца сумненнем у існаванні якога н. надзейнага крытэрыя ісціны. Заснавальнікам С. як філас. дактрыны лічыцца стараж.-грэч. філосаф Пірон (каля 365—275 да н.э.), сістэматызаваў такія погляды *Секст Эмпірык*. У сярэдневякоўі С. выступаў як сінонім вальнадумства, форма крытыкі царк. догматаў (напр., твор П.Абеляра «Так і не так»). У 16—18 ст. ідэі С. былі накіраваны супраць сярэдневяковай схаластыкі (М. дэ Мантэнь, П.Шарон, П.Бейль і інш.). У філасофіі Д.Юма, І.Канта ён прымаў такую форму, якая прыводзіла да *агнастыцызму*. С. грунтуецца на розных тэарэт. перадумовах. Імі могуць быць або сумненне ў надзейнасці пачуццёвага пазнання, або перабольшванне значэння факта адноснасці (незавершанасці, зменлівасці) чалавечых ведаў. У апошнім выпадку С. з'яўляецца рэакцыяй на дагматызм абстрактных філас. пабудоў, што праявілася ў філасофіі Юма, Канта, пазітывістаў (А.Конта, Г.Спенсера). У звычайным сэнсе С. — гэта настрой, псіхічны стан няўпэўненасці, якія арыентуюць на ўстрыманне выказваць якія-н. катэгарычныя меркаванні.

Літ.: Рихтер Р. Скептицизм в философии: Пер. с нем. Т. 1. СПб, 1910; Лосев А.Ф. Культурно-историческое значение античного скептицизма и деятельность Секста Эмпирика // Секст Эмпирик. Соч. М., 1975. Т. 1; Рассел Б. История западной философии...: Пер. с англ. 3 изд. М., 2000.

А.Б.Савеня.

«СКЕПТЫ́ЧНАЯ ШКО́ЛА», крытычны кірунак у рас. гістарыяграфіі 1-й пал. 19 ст. Заснавальнік — М.Т.Качаноўскі. Да «С.ш.» належалі В.М.*Бадзянскі*, С.М.Строеў, блізкія погляды мелі П.М.Строеў і інш. Прадстаўнікі «С.ш.» крытыкавалі канцэпцыі афіц. гісторыкаў, асабліва М.М.*Карамзіна*, даказвалі неабходнасць параўнальна-гіст. вывучэння мінулага Расіі, крытычных адносін да крыніц, праверкі сапраўднасці тэкстаў і аналізу зместу выкладзеных у іх падзей. Яны лічылі, што рус. *летапісы* 11—12 ст., *Руская праўда*, *«Слова аб палку Ігаравым»* і інш. стараж. помнікі не могуць служыць гіст. крыніцамі пры вывучэнні *Кіеўскай Русі*, бо ўзніклі, на іх думку, значна пазней за перыяд яе існавання і выключна пад уплывам замежных літ. і дакумент. крыніц. Выступалі супраць *нарманскай тэорыі*, падзялялі погляды І.Эверса пра хазарскае паходжанне Русі. Нягледзячы на спрэчнасць яе канцэпцый, «С.ш.» — важны этап у фарміраванні рас. гістарыяграфіі.

СКЕП'ЯН Мікалай Антонавіч (н. 18.8.1931, г. Петрыкаў Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне ўнутраных хвароб. Д-р мед. н., праф. (1986). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1958). З 1964 у Бел. мед. акадэміі паслядыпломнага навучання (з 1983 заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях алергалогіі і медыцыны працы. Удзельнічаў у распрацоўцы і ўкараненні тэхналогіі лячэбна-аздараўленчага спелеакомплексу на базе рудніка вытв. аб'яднання «Беларускалій».

Тв.: Аллергические болезни: дифференц. диагноз, лечение. Мн., 2000.

СКЕРНЯВІ́ЦКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Województwo Skierniewickie), былая адм.-тэр. адзінка ў цэнтр. ч. Польшчы. З 1999 у складзе *Лодзінскага ваяводства*.

СКЕ́РЦА (ад італьян. scherzo літар. жарт), у 16—17 ст. вак. п'еса (адна- або шматгалосая) на жартоўныя тэксты або яе інстр. пералажэнне. З 2-й пал. 18 ст. адна з частак (звычайна 3-я) *санатна-сімфанічнага цыкла*, якая замяніла *менуэт*. Для С. характэрны хуткі, жывы тэмп, рэзкая змена кантрастных вобразаў (нар.-жанр., гульнёвых, гратэскных і інш.), трохдольны памер (3/4 ці 3/8), складаная 3-часткавая форма з трыо (уласцівая і менуэту). Класічны тып С. склаўся ў творчасці Л.Бетховена. З 19 ст. С. развівалася і як частка цыкла (творчасць зах.-еўрап. кампазітараў-рамантыкаў і рус. класікаў) і як самаст. муз. п'еса, блізкая да *капрычыо* («Скерца» Ф.Шапэна, арк. скерца М.Мусаргскага і інш.). Бел. кампазітары шырока выкарыстоўваюць С. ў традыц. формах часткі санатна-сімф. цыкла і асобнай муз. п'есы. Сустракаецца ў творах М.Аладава, А.Багатырова, Дз.Смольскага, Г.Вагнера, Я.Дзягцярыка, А.Мдываніі, Ф.Пыталева, Р.Суруса, Я.Цікоцкага і інш. *Т.А.Шчэрба.*

СКЕТЧ (ад англ. sketch накід), кароткая п'еса (гал. чынам *камедыя*) для 2 (радзей 3) выканаўцаў. Бярэ пачатак ад нар. *інтэрмедыі*.

СКІ́БА Аляксандр Мікалаевіч (н. 18.7.1949, с. Гардзееўка Клінцоўскага р-на Бранскай вобл., Расія), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1993), праф. (1994). Скончыў Навазыбкаўскі пед. ін-т (1971). З 1986 у Гомельскім ун-це (з 1996 заг. кафедры). Навук. працы па тэорыі класаў груп і інш. алгебраў. Пабудаваў тэорыю падгрупавых і падсістэмных функтараў. Распрацаваў рашоточатыя метады даследавання класаў алгебраў.

Тв.: Формации алгебраических систем. М., 1989 (разам з Л.А.Шамятковым); Алгебра формаций. Мн., 1997.

СКІ́БА Віктар Пятровіч (17.1.1956, в. Сынковічы Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл. — 27.8.2000), бел. вучоны ў галіне фтызіятрыі. Д-р мед. н. (1995), праф. (1999). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1979). З 1979 працаваў у БелНДІ пульманалогіі і фтызіятрыі. З 1985 у Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў. Навук. працы па функцыян. дыягностыцы абструктыўнага сіндрому ў хворых з лёгачнымі паталогіямі.

СКІБІ́НСКІ (Skibiński) Казімеж Міхал (6.3.1786, г. Вільня — 1.3.1858), польскі

драм. акцёр, спявак, рэжысёр. Вучыўся ў Вільні, дзе дэбютаваў 5.10.1802 у дзіцячым балеце ў ролі Солтыса («Сельскі натоўп, або Гарэзлівы пан»). Паводле сведчання сучаснікаў, С. найб. вылучаўся ў характарных ролях, па-майстэрску падкрэсліваў адмоўныя рысы персанажаў. Шмат гастраліраваў па гарадах Польшчы, Украіны, Прыбалтыкі, а таксама на Беларусі ў складзе розных тэатр. калектываў: трупа Я.Шыманскага (1803, Гродна, Зэльва, Свіслач, Слонім), антрэпрыза М.Кажынскага [1804—10, Асвея (Верхнядзвінскі р-н), Бешанковічы, Віцебск, Мінск, Полацк], антрэпрыза А.Жукоўскага (1833—34, Мінск), таксама Гродна (1827, 1828, 1830). З 1816 рэжысёр трупы віленскіх акцёраў, з якой наведаў Гродна і Свіслач, Мінск (сезон 1817—18). Перыядычна выступаў у Віленскім тэатры. З 1845 жыў і працаваў на Валыні і Падоллі.

Тв.: Pamiętnik aktora. Warszawa, 1912.

СКІБНЕ́ЎСКІ Аляксандр Браніслававіч (8.4.1903, Масква — 21.4.1978), рэжысёр і педагог. Засл. дз. маст. Удмурціі (1945). Засл. дз. маст. Беларусі (1952). Скончыў Дзярж. эксперыментальныя тэатр. майстэрні ў Маскве (1926, клас А.Таірава). З 1927 працаваў у розных тэатрах. У 1958—70 выкладаў у Харкаўскім ін-це мастацтваў. У 1949—58 гал. рэж. Бел. т-ра імя Я.Коласа. Пастаноўкі С. вызначаліся яснасцю рэжысёрскай задумы, дакладным адборам выяўл. сродкаў, глыбокай псіхал. характарыстыкай персанажаў, маштабнасцю сац. абагульненняў. З лепшых спектакляў бел. драматургіі: «Раскіданае гняздо» Я.Купалы (1951), «Выбачайце, калі ласка!» А.Макаёнка (1953), «Машэка» В.Вольскага (1954), «На крутым павароце» К.Губарэвіча (1956), «Людзі і д'яблы» К.Крапівы (1958). Сярод інш. пастановак: «Вяселле Крачынскага» А.Сухаво-Кабыліна (1949), «Жывы труп» Л.Талстога, «Тры сястры» А.Чэхава, «На дне» М.Горкага (усе 1951), «Настаўнік танцаў» Лопэ дэ Вэгі (1952), «Шторм» У.Біль-Белацаркоўскага (1953), «Ноч памылак» О.Голдсміта (1954), «Мараль пані Дульскай» Г.Запольскай (1956), «Чужы цень» (1949) і «Гісторыя аднаго кахання» (1954) К.Сіманава. Аўтар тэатразнаўчых прац.

Тв.: Народны артыст СССР А.К.Ільінскі. Мн., 1954.

Літ.: Н я ф ё д У. Аляксандр Скібнеўскі // Майстры беларускай сцэны. Мн., 1978. Кн. 3. *Т.Я.Гаробчанка.*

СКІВІЧНАРО́ТЫЯ (Gnathostomata), найбольш шматлікая на Зямлі група пазваночных жывёл. Складае 99,8% усёй колькасці відаў тыпу хордавых. Уключае 2 кл. рыб (*храстковыя рыбы* і *касцявыя рыбы*) і 4 кл. наземных жывёл (*земнаводныя, паўзуны, птушкі* і *млекакормячыя*). Найб. важныя рысы С.: хватальны сківічны апарат, які развіўся з жаберных дуг; парныя канечнасці ў выглядзе плаўнікоў (у насельнікаў вады), пяціпальцых канечнасцей (у насельнікаў сушы) або крылаў. У шкілеце ёсць храстковая ці касцявая тканка. Парныя ноздры; 3 паўкружныя каналы ва ўнутр. вуху.

СКІД у г е а л о г і і, тэктанічны разрыў з вертыкальнай або стромка нахіленай плоскасцю зруху горных парод, дзе вісячы блок апушчаны адносна ляжачага ці ляжачы ўзняты адносна вісячага. Утвараюцца пераважна ва ўмовах расцяжэння зямной кары (С. расцяжэння). Амплітуды С. дасягаюць 1 км і больш (у рыфтах). Адрозніваюць С. сколвання, адколвання (развіваюцца з трэшчын), гравітацыйная (на месцы асядання ўчасткаў зямной кары і інш.). Парнае спалучэнне С. утварае скідавыя ўпадзіны — *грабены* і выступы — *горсты*. Гл. таксама *Ускід*. *І.В.Клімовіч.*



Скід.

СКІ́ДАВЫЯ ГО́РЫ, тое, што *глыбавыя горы*.

СКІ́ДЗЕЛЬ, горад у Гродзенскім р-не на р. Скідзелька. За 30 км ад Гродна. Чыг. станцыя на лініі Гродна—Масты; вузел аўтадарог на Гродна, Ліду, Масты, Азёры, Астрыну. 11,3 тыс. ж. (2001).

Вядомы з пач. 16 ст. як велікакняжацкі двор з воласцю ў Гродзенскім пав. ВКЛ. З 1588 С. — каралеўскі двор Гродзенскага староства Трокскага ваяв., адм.-гасп. цэнтр воласці. Паводле прывілея 1644 караля Уладзіслава IV у С. праводзіліся 2 кірмашы на год, таргі 2 разы на тыдзень. З 1783 мястэчка Гродзенскай эканоміі, цэнтр *ключа*. З 1795 у Рас. імперыі, у Гродзенскім пав. У 1885 — цэнтр воласці Гродзенскага пав., 1531 ж., гарбарная прамысловасць, бровар, нар. вучылішча (з 1860), 2 царквы, 4 крамы, аптэка, таргі. У 1897 — 2790 ж., 482 будынкі, бальніца. З 1921 у складзе Польшчы, цэнтр гміны Гродзенскага пав. Беластоцкага ваяв. З 1939 у БССР, з 15.1.1940 — гар. пасёлак, цэнтр *Скідзельскага раёна* і сельсавета (з 12.10.1940) Беластоцкай, з 20.9.1944 — Гродзенскай абл. 27.6.1941 акупіраваны ням. фашыстамі, якія стварылі ў С. лагер смерці і загубілі там 2330 чал. На тэр. раёна дзейнічалі *Скідзельская раённая антыфашысцкая арганізацыя* і *Скідзельскае камсамольска-маладзёжнае падполле*. 14.7.1944 С. вызвалены войскамі 2-га Бел. фронту ў ходзе *Беластоцкай аперацыі 1944*. З 25.12.1962 у Гродзенскім р-не. У 1967 у межы С. ўключаны нас. пункт Саўгас Скідзельскі і пас. Цукровы Завод. У 1973 — 8,6 тыс. ж. З 30.1.1974 горад.

Працуюць прадпрыемствы: адкрытыя акц. т-вы *«Скідзельскі цукровы камбінат»* і «Гроднахлебапрадукт», Скідзельскі камбінат будаўнічых матэрыялаў, з-д жалезабетонных вырабаў, племптушкарэпрадуктар «Юбілейны», камбінат быт. абслугоўвання і інш.; цэнтр саўгаса «Скідзельскі». У горадзе 3 сярэднія, муз. і спарт. школы, 3 б-кі, 2 дамы культуры, музей бел. паэта Міхася Васілька. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, 2 магілы камсамольцаў-падпольшчыкаў, магіла ахвяр фашызму, помнік камсамольцам-падпольшчыкам. Помнікі архітэктуры: царква Міхаіла Архангела (1851), касцёл Успення Маці Божай (1870-я г.), *Скідзельскі парк*.

Літ.: Д з е л я н к о ў с к і М.І. Скідзель: Дак.-літ. нарыс. Мн., 1987. *В.М.Князева.*

СКІ́ДЗЕЛЬКА, Скідзяліца, Скідзянка, рака ў Мастоўскім і Гродзенскім р-нах, левы прыток р. Котра (бас. р. Нёман). Даўж. 28 км. Пл. вадазбору 450 км^2. Цячэ па Нёманскай нізіне. Пачынаецца за 5 км на ПнУ ад в. Заполле Мастоўскага р-на, упадае ў р. Котра каля в. Некрашы Гродзенскага р-на. Рэчышча на працягу 22,5 км (ад вытоку да упадзення р. Спушанка) каналізаванае.

СКІ́ДЗЕЛЬСКАЕ КАМСАМО́ЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў вер. 1941 — ліп. 1944 у г. Скідзель і раёне Беластоцкай (цяпер у Гродзенскай) вобл. пад кіраўніцтвам скідзельскіх раённых антыфаш. к-та (з ліст. 1942), падп. райкомаў ЛКСМБ (з вер. 1943) і КП(б)Б (з ліст. 1943), у цесным кантакце са *Скідзельскай раённай антыфашысцкай арганізацыяй*. Складалася з падп. арг-цый і груп у г. Скідзель, вёсках Бандары, Кашублінцы, Княжаводцы, Крушнікі, Лаўна, Хвайняны, Чарлёны (кіраўнікі М.С.Дзелянкоўскі, А.І.Зелянкоўскі, У.С.Кізевіч, Ф.І.Макарчук, А.К.Ролік, І.А.Сеўрук, І.М.Сініца, І.А.Шчасны і інш.). Падпольшчыкі распаўсюджвалі лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро, збіралі для партызан зброю, боепрыпасы, харч. прадукты, адзенне, медыкаменты, разведданыя пра фаш. гарнізоны і апорныя пункты, рух варожых падраздзяленняў па чыг. і шашэйных дарогах, удзельнічалі ў дыверсійных аперацыях партызан. У барацьбе з акупантамі загінула 13 падпольшчыкаў. У г. Скідзель ў гонар падполля помнік. *Л.В.Аржаева.*

СКІ́ДЗЕЛЬСКАЯ РАЁННАЯ АНТЫФАШЫ́СЦКАЯ АРГАНІЗА́ЦЫЯ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў ліст. 1942 — ліп. 1944 у г. Скідзель і раёне Беластоцкай (цяпер у Гродзенскай) вобл. пад кіраўніцтвам скідзельскіх раённых антыфаш. к-та, падп. райкома КП(б)Б (з ліст. 1943) і Беластоцкага абл. антыфаш. к-та, у цесным кантакце са *Скідзельскім камсамольска-маладзёжным падполлем* і групамі *Баранавіцкай акруговай антыфашысцкай арганізацыі*. Складалася з падп. груп (каля 90 чал., кіраўнікі М.М.Бедыс, А.Я.Мажэйка, А.Ф.Манкевіч, А.А.Патапаў, У.А.Сыты, С.І.Таранка і

інш.). Дзейнасць арг-цыі ўзначальваў к-т (Бедыс, І.С.Быль, Манкевіч). Падпольшчыкі вялі сярод насельніцтва паліт. агітацыю, хавалі і лячылі сав. воінаў, што трапілі ў акружэнне, перапраўлялі іх у партыз. атрады, збіралі і перадавалі партызанам зброю, боепрыпасы, медыкаменты, разведданыя пра перамяшчэнні акупантаў, праводзілі дыверсіі на чыгункі, парушалі тэлеф.-тэлегр. сувязь праціўніка, удзельнічалі ў аперацыях партызан. У барацьбе супраць фаш. захопнікаў загінула 20 падпольшчыкаў. *Л.В.Аржаева.*

СКІДЗЕЛЬСКІ КАМБІНА́Т БУДАЎНІ́ЧЫХ МАТЭРЫЯЛА́Ў. Утвораны ў 1944 у г. *Скідзель* Гродзенскага р-на як райпрамкамбінат на базе прамысл. арцелі. У 1945 далучаны цагельныя з-ды «Міхайлаўка» і «Луна», у 1954 — лесазавод «Азёры», у 1963 — кафляныя цэхі «Агароднікі» і «Астрына», цагельны з-д «Догі» і вапнавы з-д «Ішчална», у 1964 — быткамбінат. У 1966 пасля рэарганізацыі ўсе майстэрні перададзены райбыткамбінату. З 1975 — сучасная назва. У 1990—91 уваходзіў у склад Ваўкавыскага ВА «Будматэрыялы». На 2001 у камбінаце працуюць лесацэх і цэх гумава-тэхн. вырабаў (часова закансерваваны). Асн. прадукцыя: піламатэрыялы, сталярныя і паганажныя вырабы, драўляная скрынкавая тара, паліцы драўляныя для даспявання і захоўвання сыроў і інш.

СКІДЗЕЛЬСКІ ПАРК, помнік садова-паркавага мастацтва сярэдзіны 19 ст. ў г. Скідзель Гродзенскага р-на. Парк мяшанага пейзажна-рэгулярнага тыпу. Пл. 4,8 га. На тэрыторыі парку 2 каналы. У ніжняй ч. парку захаваліся рэшткі старых прысад з ліпы, конскага каштана звычайнага, грабавыя шпалеры; у яе кампазіцыі творы архітэктуры малых форм: капліца, уязная брама ў выглядзе 2 круглых мураваных вежачак з конусападобнымі дахамі. Верхняя ч. парку больш багатая паводле дэндралагічнага складу. Растуць экзоты: хвоя веймутава, ліпа амер., арэх шэры, акацыя белая, ясень звычайны (форма ніцая) і інш. *В.Р.Анціпаў.*

СКІДЗЕЛЬСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1940—62. Утвораны 15.1.1940 у Беластоцкай вобл. Цэнтр — г.п. *Скідзель*. 12.10.1940 падзелены на 11 сельсаветаў. З 20.9.1944 у Гродзенскай вобл. 25.12.1962 раён скасаваны, сельсаветы перададзены *Гродзенскаму раёну*.

СКІДЗЕЛЬСКІ ЦУКРО́ВЫ КАМБІНА́Т. Засн. ў 1947 у г. *Скідзель* Гродзенскага р-на як Бел. цукровы камбінат на базе Скідзельскага буракасаўгаса, Гродзенскай буракабазы і Бел. цукровага з-да (будаваўся ў 1946—51). Прадукцыю выпускае з 1951. У 1961 уведзены ў дзеянне цэх па вытв-сці лімоннай кіслаты з патакі. У 1993 здадзены ў эксплуатацыю тэхналагічны корпус з вытворчай магутнасцю 3 тыс. т цукру за суткі. З 1997 — адкрытае акц. т-ва. Асн. прадукцыя (2001): цукар-пясок, лімонная кіслата, вапна таварная, патака.

СКІ́КДА, горад на ПнУ Алжыра. Адм. ц. аднайм. вілайі. Вядомы са стараж. часоў. Каля 200 тыс. ж. (2001). Вузел аўтадарог, марскі порт (экспарт нафты і звадкаванага газу), канцавы пункт нафта- і газаправодаў з Сахары. Аэрапорт. Прам-сць: нафтахім., нафтаперапр., харч. (аліўкавы алей, садавінныя і рыбныя кансервы). Вытв-сць пластмас. Апрацоўка кары коркавага дуба. Музей (у т.л. карфагенскія і рым. зборы). Руіны рым. амфітэатра.

СКІЛУ́Р (грэч. Skiluros), скіфскі цар 2 ст. да н.э. Вядомы з твораў *Страбона*, *Плутарха*, з надпісаў на манетах г. Ольвія. Пры ім познаскіфскае царства (ахоплівала панізоўі Паўд. Буга, Дняпра, стэпавы Крым) дасягнула значнага росквіту: мела флот, у Ольвіі чаканіла манету, вяло гандаль. Каб пашырыць свае ўладанні і атрымаць выхад да мора, С. заключыў ваен. саюз з сармацкім племем раксаланаў і пачаў вайну. Аднак пантыйскі цар *Мітрыдат VI Еўпатар* узяў пад абарону Херсанес. У час вайны з Мітрыдатам С. памёр, а Скіфія каля 108—107 да н.э. пацярпела паражэнне. У сталіцы царства Неапалі скіфскім (цяпер на тэр. г. Сімферопаль, Украіна) выяўлены грэч. надпіс з імем цара С. і яго маўзалей. *А.Г.Зельскі.*

Скідзельскі парк. Схема планіроўкі.

Дзяўчына ў скіндачцы. Светлагорскі раён Гомельскай вобл. Пачатак 20 ст.

СКІ́НДАЧКА, у беларусаў дзявочы галаўны ўбор. Называлі таксама апаяска, завязка, шырынка. Кроілі ў выглядзе ручніка з даматканага кужэльнага палатна рознай танальнай адбелкі, радзей з белага паркалю або з бела-чырвонай у бела-блакітныя папярочныя паскі баваўнянай даматканкі (шыр. 10—30, даўж. 70—140 см). Завязвалі на патыліцы так, каб не закрывала макаўку галавы, а свабодныя канцы звісалі на спіну ці грудзі. Шылі С. з 3 частак — вузкай, сярэдняй і шырокіх бакавых. Шырокія С. складвалі па даўжыні ў 2—4 столкі; у тую частку, што абвязвала галаву, устаўлялі паперу, кардон, луб або падшывалі палатно. Святочныя С. аздаблялі вышыўкай (крыжыкам, процягам, мярэжкай, гафтам), узорыстым натыканнем, карункамі, мохрыкамі, аплікацыяй і інш. Часцей выкарыстоўвалі геам. арнамент: па канцах С. размяшчалі шырокі ўзорысты шляк, адзін або два падоўжныя бакі аздаблялі вузкімі ўзорыстамі паскамі. Каларыт арнаменту чырвона-малінавы з чорнымі і блакітнымі ўкрапінамі, радзей белы з чырвоным. У вясельным касцюме С. дапаўняў вянок з кветак. Шырока бытавала да канца 19 ст. амаль па ўсёй Беларусі, у 1-й пал. 20 ст. захавалася ў *калінкавіцкім строі*. *М.Ф.Раманюк.*

СКІ́НЕР (Skinner) Берэс Фрэдэрык (20.3.1904, г. Саскуэхана, ЗША — 18.8.1990), амерыканскі псіхолаг і філосаф; прадстаўнік *біхевіярызму*. Чл. Нац. АН ЗША. Д-р філасофіі (1931), праф. (1948). Скончыў Гамільтонскі каледж (1926). На аснове даследаванняў паводзін жывёл распрацаваў канцэпцыю аперантнага (ад «аперацыя») абумоўлівання, якое прынцыпова адрозніваў ад умоўна-рэфлекторнага. Сцвярджаў, што прынятая прадстаўнікамі класічнага біхевіярызму (Дж.Уотсан і інш.) і *неабіхевіярызму* (Э.Толмен, К.Хал) схема «стымул—рэакцыя» не ўлічвае ўплыву рэакцыі на паводзіны («Паводзіны арганізмаў», 1938). Лічыў, што арганізм набывае новыя рэакцыі, таму што сам заахвочвае (падмацоўвае) іх, і толькі пасля гэтага знешні стымул выклікае рэакцыю. Кожная рэакцыя, на яго думку, заснавана на папярэднім вопыце і генетычным кодзе, а ўсе паводзіны можна расцэньваць як абумоўленае спалучэнне пазітыўных і негатыўных стымулаў (напр., ежа, увага, голад, боль, пахвала,

прыніжэнне). Паводле С., у грамадстве не можа быць незалежнага «аўтаномнага чалавека», бо паводзіны індывіда абумоўлівае і кантралюе сац. асяроддзе праз сац. ін-ты, звычаі, мову, сродкі камунікацыі і г.д. Альтэрнатывай такому ўздзеянню лічыў сац. формы супольнасцей, члены якіх павінны быць інтэграваны ў сістэму пазітыўнага псіхал. падмацавання (узаемавыгадныя, справядлівыя адносіны індывідаў адзін да аднаго ў працэсе зносін), у выніку чаго адпадае неабходнасць у рэпрэсіўных ін-тах («Па той бок свабоды і годнасці», 1971). Гэтая канцэпцыя атрымала назву сац. біхевіярызму. Працы С. заклалі псіхал. і метадалагічныя асновы сучаснага *праграмаванага навучання*, якое ён разглядаў як «паслядоўнае навядзенне» на патрэбную рэакцыю («Тэхналогія навучання», 1968). Аўтар прац «Навука і паводзіны чалавека» (1953), «Пра біхевіярызм» (1974), «Аўтабіяграфіі» (т. 1—2, 1976), рамана-утопіі «Уолдэн-2» (1948) і інш.

Тв.: Рус. пер. — Наука об учении и искусство обучения // Программированное обучение за рубежом. М., 1968; Оперантное поведение // История зарубежной психологии, 30—60-е гг. XX в.: Тексты. М., 1986.

Літ.: Ярошевский М.Г. Психология в XX столетии. М., 1971; Кондрашенко В.Т., Донской Д.И. Общая психотерапия. 2 изд. Мн., 1997; Майерс Д. Псіхалогія: Пер. з англ.- Мн., 1997. *С.Ф.Дубянецкі.*

СКІН-ЭФЕ́КТ (ад англ. skin скура, абалонка + *эфект*), паверхневы эфект, затуханне электрамагнітных хваль па меры іх пранікнення ў праводнае асяроддзе. У выніку пераменны ток размяркоўваецца пераважна ў паверхневым слоі (скін-слоі) правадніка, пераменны магн. паток — у паверхневым слоі магнітаправода.

С.-э. тлумачыцца тым, што пад дзеяннем знешняга пераменнага поля свабодныя электроны правадніка ствараюць *віхравыя токі*, поле якіх кампенсуе знешняе поле ў аб'ёме правадніка. У выніку частка эл.-магн. энергіі пераўтвараецца ў цеплавую, што і вядзе да затухання хваль. Праяўленне С.-э. тым большае, чым большая частата току або магн. патоку, плошча сячэння провада або магнітаправода, праводнасць і магн. пранікальнасць матэрыялу. С.-э. вядзе да павелічэння эл. супраціўлення провада пераменнаму току ў параўнанні з супраціўленнем пастаяннаму току і да размагнічвання магнітаправода віхравымі токамі. На С.-э. заснаваны дзеянне эл.-магн. экранаў, высокачастотная паверхневая загартоўка стальных вырабаў і інш.

СКІ́ПА (Schipa) Ціта (2.1.1889, г. Лечэ, Італія — 16.12.1965), італьянскі спявак (лірычны тэнар). Вучыўся ў А.Джэрунды ў Лечэ і ў Э.Пікалі ў Мілане. У 1910—55 выступаў на сцэне італьян. і інш. оперных т-раў Еўропы і Амерыкі, у т.л. Чыкагскага, «Метраполітэн-опера», «Ла Скала». З 1946 выступаў і як канцэртны выканаўца. Адзін з буйн. італьян. оперных спевакоў 20 ст. Майстар бельканта. Яго голас вылучаўся багаццем адценняў, пластычнасцю, пяшчотнасцю і мяккасцю гучання. Сярод лепшых партый: граф Альмавіва («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Немарына, Эрнеста («Любоўны напітак», «Дон Паскуале» Г.Даніцэці), Вертэр («Вертэр» Ж.Маснэ). Спяваў у спектаклях з Ф.Шаляпіным. Здымаўся ў муз. кінафільмах, у т.л. «Любімыя арыі». Аўтар аперэты «Прынцэса Ліяна» (паст. 1935), хар. і фп. твораў, песень.

Літ.: Лаури-Вольпи Дж. Вокальные параллели: Пер. с итал. Л., 1972.

СКІ́ПАВЫ ПАД'ЁМНІК, установка для транспартавання сыпкіх грузаў з дапамогай аўтаматычна разгружальных корабаў (скіпаў). Складаецца з рэйкавых (з вуглом пад'ёму да 45°) і інш. жорсткіх накіравальных, скіпаў (падвешваюцца да цягавых канатаў, разгружаюцца перакульваннем або праз адкідное дно), пад'ёмнай машыны (лябёдкі), капра, перагрузачных прыстасаванняў. Выкарыстоўваюцца для пад'ёму карысных выкапняў і пароды па шахтавых стваллах, для загрузкі шыхты ў доменныя печы, вагранкі, падачы вугалю ў кацельні і інш.



Скіпавы пад'ёмнік: 1 — шахтавы; 2 — загрузачны (да вібрапрасавальнай машыны).

СКІ́ПЕТР (ад грэч. skēptron жазло, посах ад skēptomai абапіраюся), адзін са знакаў (рэгалій) манархічнай улады ў выглядзе жазла, упрыгожанага каштоўнымі камянямі і разьбой.

СКІРГА́ЙЛА (у праваслаўі Іван; каля 1354 — 23.12.1394?), князь полацкі, трокскі і кіеўскі ў ВКЛ. Сын *Альгерда*, брат *Ягайлы*. Пасля выгнання ў 1377 з Полацка кн. *Андрэя Альгердавіча* вял. кн. Ягайла пасадзіў там княжыць С. Палачане, незадаволеныя язычніцтвам С., у 1381 выгналі яго з княжання. На чале войска Ягайлы і пры дапамозе Інфлянцкага ордэна аблажыў на некалькі месяцаў Полацк, але горада не ўзяў. У гэты час прыняў праваслаўе. Калі ў канцы 1381 велікакняжацкі трон у Вільні захапіў *Кейстут*, войска, падначаленае С., прызнала ўладу новага вял. князя, а С. ўцёк у Інфлянты. Летам 1382 С. далучыўся да войска Ягайлы, удзельнічаў у аблозе Кейстута ў Троках. У час перагавораў з Кейстутам захапіў яго ў палон і адвёз у Крэўскі замак, дзе той быў забіты. Атрымаў ад Ягайлы Трокскае княства. З гэтага часу С. стаў другой уплывовай асобай у ВКЛ. Удзельнічаў у заключэнні *Крэўскай уніі 1385* паміж ВКЛ і Польшчай, але застаўся праваслаўным. У *Мсціслаўскай бітве 1386* на чале войска ВКЛ перамог смаленскага кн. Святаслава Іванавіча і падпарадкаваў ВКЛ Смаленскае княства. Вясной 1387 узяў Полацк, дзе захапіў у палон Андрэя Альгердавіча. У 1387 Ягайла пацвердзіў права С. на валоданне Трокскім і Полацкім княствамі, даў яму Менск, Свіслач, Бабруйск, Рэчыцу, Любеч, Прапошаск, Любашаны, Ігумен, Лагойск. У выніку *Востраўскага пагаднення 1392* Ягайла фактычна прызнаў Вітаўта сваім намеснікам у ВКЛ і перадаў яму Трокскае княства, узамен Вітаўт абяцаў С. дапамагчы захапіць Кіеў. Вясной 1393 Вітаўт захапіў у кіеўскага кн. Уладзіміра Альгердавіча Жытомір і Оўруч і аддаў іх С., восенню 1393 перадаў С. Кіеў. Пахаваны ў Кіева-Пячэрскай лаўры.

СКІ́РМУНТ Алена (Гелена; 5.11.1827, в. Калоднае Столінскага р-на Брэсцкай вобл. — 1.2.1874), бел. мастак. Маст. адукацыю атрымала ў Вільні ў В.*Дмахоўскага* (1844—45), удасканальвала майстэрства ў Берліне і Дрэздэне. У ранні перыяд творчасці пісала партрэты Канстанцыі, Тэклі Скірмунт (1845—48), Тэафілі, Зяноны Любанскіх (1850), якія вызначаюцца глыбінёй і трапнасцю характарыстык. У 1850-я г. звярнулася да рэліг. тэматыкі: «Марыя Чапская моліцца ў кляштары візітак у Вільні» (1851), алтарны абраз «Бязгрэшнае зачацце», праект алтара для касцёла ў в. Ахова каля Пінска. З мастаком-самавукам К.Радыкам рэстаўрыравала абразы і гафты на літургічных шатах у пінскім касцёле. У 1852—54 брала ўрокі скульптуры ў Вене і Рыме. Пазней працавала пераважна ў скульптуры. Выканала медалі Б.Залескага (1859), І.Ляле-веля (1860), Ю.Крашэўскага (1861) і

інш. У 1861 зрабіла рэльефы гербаў Рэчы Паспалітай, Кароны Польскай і ВКЛ. У 1863 арыштавана і выслана ў г. Тамбоў (Расія). У 1867 вызвалена, але пазбаўлена права жыхарства на радзіме, некат. час жыла ў Крыме. У 1860—70-я г. выканала жанравыя кампазіцыі «Шляхціц у сядзібе», «Муза Талія», цыкл рэльефаў з выявамі князёў ВКЛ, партрэты Януша Радзівіла, Торвальдсена і інш. Аўтар 22 пасярэбраных і пазалочаных шахматных фігурак, прысвечаных перамозе польскага войска над туркамі, сярод якіх выявы караля Яна Сабескага, гетмана Станіслава Яблоноўскага, шляхціцаў у поўным узбраенні, а таксама прадстаўнікоў турэцкага войска. *А.К.Лявонава.*

СКІ́РМУНТ Раман Аляксандравіч (7.5.1868, в. Парэчча Пінскага р-на Брэсцкай вобл. — 7.10.1939), бел. паліт. і грамадскі дзеяч. Са шляхецкага роду *Скірмунтаў*. Скончыў Рыжскую гімназію. Быў старшынёй Т-ва па распрацоўцы с.-г. і эканам. патрэб Палесся, адным з кіраўнікоў *Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі*. Адзін з ідэолагаў краёўцаў, аўтар публіцыстычных твораў. Дамагаўся стварэння *Краёвай партыі Літвы і Беларусі* як міжнац. блока польскай, літ. і бел. парт. арг-цый. У 1906 дэпутат І Дзярж. думы Рас. імперыі, ініцыятар аб'яднання дэпутатаў-краёўцаў у т.зв. Групу зах. украін. Выступаў супраць адчужэння прыватнаўласніцкіх зямель і перадачы іх у дзярж. фонд, быў прынцыповым апанентам сацыяліст. ідэі абагульнення зямлі і інш. сродкаў вытворчасці. У кастр. 1910 — студз. 1911 чл. Дзярж. савета Рас. імперыі. Уваходзіў ва ўправу Віленскага зямельнага банка. З 1911 гласны Мінскага губ. земства, з 1914 чл. Мінскага губ. к-та Усерас. земскага саюза, у 1917 заг. аддзела Мінскага губ. харчовага к-та. У студз. 1917 узначаліў *Мінскі аддзел Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны*, у сак.—ліп. 1917 старшыня *Беларускага нацыянальнага камітэта*. У крас. 1917 узначальваў бел. дэлегацыю да рас. Часовага ўрада з патрабаваннем аўтаноміі Беларусі. Кіраўнік *«Менскага беларускага прадстаўніцтва»*, ад якога ў крас. 1918 увайшоў у *Раду Беларускай Народнай Рэспублікі*. У ліп. 1918 узначальваў *Народны сакратарыят Беларусі*, у праграмнай дэкларацыі якога 9.7.1918 выказаўся за здабыццё дзярж. органамі БНР рэальнай улады, збіранне вакол яе ўсёй этнічнай тэр. беларусаў, памяркоўную агр. рэформу шляхам выкупу сялянамі памешчыцкай зямлі праз парцэляцыйны банк, за развіццё бел. культуры. Пасля працаваў у міжнар. камісіі Рады БНР, у ліст. 1918 у складзе надзвычайнай бел. дэлегацыі быў у Германіі і Швейцарыі з мэтай дамагчыся міжнар. прызнання незалежнасці Беларусі. У час сав.-польскай вайны імкнуўся не дапусціць падзелу Беларусі паміж супрацьлеглымі бакамі, выказваўся за ўваходжанне краю цалкам у склад II Рэчы Паспалітай на ўмовах уніі ці шырокай аўтаноміі. Адзін з заснавальнікаў Польска-бел. т-ва ў Варшаве (1919). У 1930 абраны сенатарам Рэчы Паспалітай. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР расстраляны.

Літ.: Смалянчук А. Раман Скірмунт: шлях да Беларусі // Спадчына. 1994. № 6; Рудовіч С. «... Беларускі дзеяч з вялікіх паноў»: Эпізоды паліт. біягр. Рамана Скірмунта // Гістарычны альманах. Гародня, 1999. Т. 2. *С.С.Рудовіч.*

Р.А.Скірмунт.

СКІ́РМУНТЫ, шляхецкі род уласнага герба (з 19 ст. герба «Дуб») у ВКЛ і Рас. імперыі. Выводзілі сябе ад легендарнага летапіснага кн. Скірмунта. Верагодна, паходзілі з Упіцкага пав. Пачынальнік пінскай лініі роду Богуш С. у 1543 быў падстаростам давыд-гардоцкім. Найб. вядомыя:

Аляксандр (? — да сак. 1746), пінскі абозны, скарбнік з 1720, гараднічы з 1726. Аляксандр (? — да чэрв. 1801), сын Баніфація, пінскі каморнік гранічны з 1779, мастаўнічы з 1793, харунжы. Каспар Вінцэнт (4.1.1775—?), сын Аляксандра, пінскі падсудак у 1799—1805, падкаморы ў 1820—26. Сымон (1751—?), сын Ігнація, пінскі мастаўнічы з 1776, мечнік з 1790, падчашы з 1793, маршалак брэсцкі ў 1799, дэп. Трыбунала ВКЛ (1776), з 1790 пасол на Чатырохгадовы сойм 1788—92. Адам (? — да студз. 1820), сын Міхала, пінскі канюшы з 1765, суддзя земскі з 1790, падкаморы з 1811, пасол на соймы 1773—75 і 1793, з 1794 чл. Пастаяннай рады. Аляксандр Ізідар [1(21?).1.1799, в. Моладава Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл. — 22.7.1870], сын Сымона, маршалак пінскі ў 1832—34, камергер (1834). У 1830 заснаваў цукр. ф-ку ў Моладаве, у 1836 — суконную і цукровую ф-кі ў Парэччы, свечачную і мылаварную ф-ку ў Альбрэхтаве, ф-ку с.-г. прылад у Дастоеве, паравы млын у Пінску. Займаўся вінаградарствам у Крыме і Італіі. Алена (1827—74), гл. *Скірмунт А. Канстанцыя* (1852, в. Калоднае Столінскага р-на Брэсцкай вобл. — 23.1.1934), дачка Казіміра і Алены С., публіцыстка, гісторык. Аўтар кн. «Гісторыя Літвы, выкладзеная ў нарысе» (1886), «З найстаражытнейшых часоў літоўскага племені» (1892), «Паданні: Даміндоўгавы часы. Гісторыя старажытнай Прусіі» (1903), «Міндоўг — кароль Літвы» (1909). Належала да краёўцаў, як публіцыст выступала ў час. *«Край»*, газ. «Przegląd Wileński» («Віленскі агляд»), *«Виленский вестник»*. Канстанцін (30.8.1866, в. Моладава — 24.7.1949), сын Генрыка, дыпламат. Адзін з заснавальнікаў *Краёвай партыі Літвы і Беларусі* (1907). У 1909—17 чл. Дзярж. Савета. У 1919—21 міністр замежных спраў, у 1921—22 міністр замежных спраў, у 1922—34 пасол у Вялікабрытаніі. Аўтар мемуараў. Генрык (1868, в. Моладава — 20.9.1939), сын Генрыка, паэт (пісаў на польск. мове), кампазітар. У 1898 выдаў зб. «З вершаў і песень Генрыка Скірмунта», у 1903—12 — зб. «Паэзія» (т. 1—2). Аўтар оперы «Пан Валадыёўскі» (пастаўлена ў 1902 у Львове). З 1920 гаспадарыў у Моладаве. Расстраляны сав. ўладамі. Раман Мар'ян (1868—1939), гл. *Скірмунт* Р.А.

У.М.Вяроўкін-Шэлюта.

СКІТ (ад грэч. askētēs аскет, падзвіжнік), самастойнае ці выдзеленае ў манастыры адасобленае жыллё пустэльніка. Манахі, якія жывуць у С., прымаюць дадатковыя зарокі (напр., строгага посту, узмоцненай малітвы, пустэльніцтва). У стараверстве С. наз. манастыр ці паселішча манастырскага тыпу.

СКІФ, міфічны родапачынальнік скіфскіх цароў. Лічыўся сынам *Геракла* (паводле інш. версіі — *Зеўса*) і Яхідны. Паводле стараж.-грэч. міфалогіі, Геракл загадаў Яхідне перадаць уладу над *Скіфіяй* таму з сыноў, хто здолее нацягнуць цеціву яго лука. Перамогшы братоў, С. стаў правіцелем краіны.

СКІ́ФІЯ, назва Паўн. Прычарнамор'я ў 7—2 ст. да н.э. ў творах ант. аўтараў. Тэр. С. займала стэпы паміж вусцямі Дуная і Дона — раёны Паўн. Прычарнамор'я і стэпавы Крым. Была заселена ўласна скіфскімі (гл. *Скіфы*) і няскіфскімі плямёнамі, блізкімі скіфам па культуры, ладзе жыцця і палітычна залежнымі ад іх. У 5—4 ст. да н.э. — 3 ст. н.э. існавала Скіфская дзяржава на чале з царом. Стараж.-грэч. гісторык Герадот уяўляў С. як квадрат з бакамі працягласцю ў 20 дзён дарогі. Пасля заняцця С. *сарматамі* Паўн. Прычарнамор'е стала наз. Сарматыяй. *А.Г.Зельскі.*

СКІ́ФСКАЯ ПЛІТА́, маладая платформа паўн. зоны *Міжземнаморскага геасінклінальнага пояса*. Займае Раўнінны Крым, Азоўскае м. і Перадкаўказзе. Мяжуе на Пн з Усх.-Еўрапейскай платформай, на Пд з Горным Крымам і краявымі прагінамі Вял. Каўказа. Складзена з фундамента (слабаметамарфізаваныя тэрыгенна-карбанатныя адклады сярэдняга палеазою; у паўд. ч. эпібайкальскія масівы метамарфічных парод), пераходнага познапермска-ранняюрскага комплексу і чахла (сярэдняюрскія — антрапагенавыя адклады, магутнасць 0,1—8 км). На С.п. вылучаюць Прычарнаморскую ўпадзіну, Сімферопальскае і Стаўрапольскае падняцці і інш. структуры. С.п. фарміравалася пераважна ў байкальскі, герцынскі і раннекімерыйскі тэктанічныя цыклы. На асадканамнажэнне ўплывала сумежная (на

Пд) альпійская геасінкліналь. Радовішчы нафты (Перадкаўказзе), газу (Раўнінны Крым, Зах. Перадкаўказзе), буйныя рэсурсы артэзіянскіх вод, здабыча солей брому і лячэбных гразей (Зах. Крым). *В.М.Губін.*

СКІ́ФЫ (грэч. Skythai), агульная назва плямён паўн.-іранскай моўнай групы, якія насялялі Паўн. Прычарнамор'е ў 7 ст. да н.э. — 3 ст. н.э. Паводле розных меркаванняў С. — выхадцы з Сярэдняй Азіі ці Сібіры. У 7 ст. да н.э. яны перасяліліся ў Паўн. Прычарнамор'е, выцесніўшы адтуль *кімерыйцаў*. С. рабілі паходы ў М.Азію, заваявалі Мідыю, Сірыю, Палесціну, панавалі ў Пярэдняй Азіі, адкуль у пач. 6 ст. да н.э. іх выцес-

Да арт. **Скіфы.** Скіфскія воіны.

нілі мідыйцы. Асн. іх месца рассялення — тэр. паміж Донам і Дунаем, стэпавы Крым. Паводле Герадота, пануючымі былі царскія С., што жылі паміж Дняпром і Донам; паміж Інгулам і Дняпром жылі С.-земляробы, правабярэжжа Ніжняга Дняпра і Крым займалі С.-качэўнікі. С. валодалі ганчарным, кавальскім, ювелірным майстэрствам; гандлявалі з грэч. гарадамі Паўн. Прычарнамор'я збожжам, футрам, жывёламі, рабамі. Паліт. аб'яднанню С. садзейнічала вайна ў 512 да н.э. з перс. царом Дарыем I (гл. *Дарый*). Саюз плямён набыў рысы дзяржавы. Улада цара была спадчыннай, але абмежавана саюзнай радай і нар. сходам. Да 340-х г. да н.э. цар Атэй завяршыў аб'яднанне С. ад Азоўскага мора да Дуная. Адм. і гандлёва-эканам. цэнтр іх дзяржавы размяшчаўся ў Ніжнім Падняпроўі каля сучаснага г. Нікапаль. У 4—3 ст. да н.э. вядомы іх т.зв. царскія курганы (*Чартамлык, Салоха*, Тоўстая магіла, Мелітопальскі, *Куль-Аба* і інш.), у якіх выяўлены бронзавыя шлемы, панцыры, шчыты, лукі, коп'і і інш. У 3 ст. да н.э. пад націскам *сарматаў* сталіца С. перанесена ў Крым, дзе на р. Салгір (каля г. Сімферопаль) узнік *Неапаль* скіфскі. Дзяржава С. дасягнула росквіту ў 2 ст. да н.э., калі яны падпарадкавалі *Ольвію* і ўладанні *Херсанеса*. У выніку паражэння ў 108—107 да н.э. ў вайне з Мітрыдатам Скіфія была аслаблена, але ў 2-й пал. 1 ст. н.э. зноў узмацнела. Скіфскае царства ў Крыме існавала да 2-й пал. 3 ст. і знішчана *готамі*. У эпоху *Вялікага перасялення народаў* С. канчаткова растварыліся сярод мноства плямён. У 4—3 ст. да н.э. на Пд Беларусі ў выніку кантактаў са С. з'явіліся бронзавыя наканечнікі стрэл з трыма і дзвюма лопасцямі. Рэчы скіфскага тыпу знаходзяць на Беларусі пры раскопках помнікаў *зарубінецкай культуры*. Зрэдку сустракаюцца на помніках мілаградскай культуры, напр. гарадзішча і бескурганны могільнік каля в. Асарэвічы Брагінскага р-на (наканечнікі скіфскіх стрэл і акінак з загнутымі ўгару канцамі наверха).

Літ.: Смирнов А.П. Скифы. М., 1966; Граков Б.Н. Скифы. М., 1971; Хазанов А.М. Социальная история скифов. М., 1975; Яго ж. Золото скифов. М., 1975; Шелов Д.Б. Северное Причерноморье 2000 лет назад. М., 1975; Брашинский И.Б. В поисках скифских сокровищ. Л., 1979; Куклина И.В. Этногеография Скифии по античным источникам. Л., 1985. *А.Г.Зельскі.*

СКІЯПАРЭ́ЛІ (Schiaparelli) Джавані Вірджыніо (14.3.1835, г. Савільяна, Італія — 4.7.1910), італьянскі астраном. Замежны чл.-кар. (1874) і ганаровы чл. (1904) Пецярбургскай АН. Скончыў Турынскі ун-т (1854). З 1859 у Пулкаўскай абсерваторыі. З 1860 у астр. абсерваторыі ў Мілане (у 1862—90 дырэктар). Навук. працы па даследаванні планет, камет і падвойных зорак, а таксама гісторыі астраноміі, матэматыцы і метэаралогіі. Распрацаваў тэорыю метэораў і ўстанавіў сувязь метэорных патокаў з кометамі (1866). Выявіў на паверхні Марса сетку тонкіх ліній, т.зв. «каналаў» (1877), гіпотэза аб штучным паходжанні якіх не атрымала пацвярджэння. Правёў грунтоўныя назіранні Меркурыя і Венеры.

Літ.: Паннекук А. История астрономии: Пер. с англ. М., 1966. С. 411—418.

СКЛАВІ́НЫ, склавы, славіны, адзін са стараж. славянскіх саюзаў плямён. Упамінаюцца гоцкім гісторыкам Іарданам (6 ст.) і ў візант. крыніцах разам з іх слав. суседзямі пад назвай *анты*. Магчыма, гэтыя два народы паходзяць ад *венедаў*, вядомых у больш ранніх антычных працах. С. з антамі жылі на Сярэднім і Ніжнім Дунаі і на прылеглых тэрыторыях, у 6—7 ст. засялялі Балканскі п-аў, у т.л. тэр. сучасных Балгарыі, Славакіі, Паўн. Грэцыі. Займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй і інш. У саюзе з інш. слав. плямёнамі вялі войны супраць Візантыйскай імперыі і качэўнікаў. *Л.Д.Побаль.*

СКЛАД у мовазнаўстве, частка слова, утвораная галосным гукам або яго спалучэннем з зычнымі на аснове злітнага з імі вымаўлення. У залежнасці ад прынцыпаў *складападзелу* існуе некалькі тэорый будовы С. У бел. мове складаўтваральныя галосныя «а», «э», «о», «у», «і», «ы» з адным («гэ», «ра»), двума («збы», «цаў»), трыма («стра», «сква», «клас»), чатырма («гвалт», «пстры») і большай колькасцю зычных, часам толькі галоснымі (акрамя «ы»): «у-бок», «а-сабліва», «і-мя». У слове бывае ад 1 да 6 і болей С. У вуснай мове пераважаюць словы больш кароткія па колькасці С. У бел. мове больш слоў 1- і 2-складовых. С. бываюць націскныя (вымаўляецца больш выразна і напружана, аднак сіла, працягласць, вышыня тону гучання не заўсёды мацней і даўжэй за ненаціскны) і ненаціскныя (пераднаціскныя: «**па-ляў**-нічымі», паслянаціскныя: «паляўні-**чы-мі**»). У слове з 5 і болей С. з націскам на 1-м С. ўзнікае пабочны націск на перадапошнім С. («вы-ра-та-ва-ны-мі»). Ад месца С. ў слове залежыць іх падзел на пачатковыя (характэрна большая гучнасць і разнастайнасць спалучэння зычных: «**ка**-валак»), канцавыя і неканцавыя («кло-па-**ты**»). У залежнасці ад месца галоснага С. бываюць адкрытыя (на канцы галосны: «два») і закрытыя (на канцы зычны: «дах»), непрыкрытыя (пачынаецца з галоснага: «эх») і прыкрытыя (пачынаецца з зычнага: «вугал»). Адкрытыя і закрытыя С. могуць быць прыкрытымі («мы», «дах») і непрыкрытымі («а», «іл»). Адкрытымі непрыкрытымі могуць быць толькі С., утвораныя адным галосным; найб. колькасць тыпаў С. — прыкрытыя. У бел. мове (у параўнанні з рус.) больш адкрытых і менш непрыкрытых С. Колькасцю С., вымаўленых за адзінку часу (секунду, мінуту), вымяраецца тэмп маўлення. Сярэдні тэмп маўлення на бел. мове — 3 С. ў секунду.

Літ.: Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985. *Г.В.Лосік.*

СКЛАД ЗЛАЧЫ́НСТВА, сукупнасць прадугледжаных *крымінальным правам* прыкмет, якія характарызуюць учыненае дзеянне як канкрэтны від *злачынства*; неабходная ўмова крымін. адказнасці. С.з. ствараюць 4 групы прыкмет, што адносяцца да аб'екта злачынства, аб'ектыўнага боку, суб'екта злачынства і суб'ектыўнага боку. С.з. вызначаны ў дыспазіцыях артыкулаў Асаблівай часткі Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Агульныя для ўсіх С.з. прыкметы і палажэнні вызначаны таксама ў Агульнай частцы гэтага кодэкса. Аб'ект злачынства — на што накіравана пасяганне — вызначаецца месцам пэўнага артыкула ў сістэме Асаблівай часткі КК. Прыкметы суб'екта злачынства — узрост, з якога настае крымін. адказнасць, наяўнасць свядомасці — прадугледжаны ў артыкулах Агульнай часткі КК, спец. прыкметы суб'екта (службовая асоба, ваеннаслужачы і інш.) — у дыспазіцыі артыкула Асаблівай часткі КК. Прыкметы аб'ек-

тыўнага боку злачынства — само дзеянне (бяздзеянне) і яго вынікі; суб'ектыўнага боку злачынства — форма *віны*, мэта, матыў — пазначаны ў дыспазіцыі артыкула, які прадугледжвае злачынства. Адсутнасць хоць бы адной з названых прыкмет сведчыць пра адсутнасць у дзеяннях пэўнай асобы С.з. і выключае крымін. адказнасць.

Г.А.Маслыка.

СКЛАДА́НАЕ СЛО́ВА, кампазіт, слова, утворанае шляхам злучэння двух ці некалькіх слоў або ўтваральных асноў (гл. *Словаскладанне*). Асновы злучаюцца інтэрфіксамі — галоснымі «а», «о», «е», «я» («вадохрышча», «глыбокапаважаны», «палявод») або непасрэдна («двухмесны», «сабекошт»). Шырока прадстаўлены сярод назоўнікаў і прыметнікаў, радзей — сярод дзеясловаў і прыслоўяў. Адносіны паміж кампанентамі С.с. суадносныя са злучальнымі («беларуска-нямецкі») або падпарадкавальнымі («дрэваапрацоўка») адносінамі ў свабодных сінтакс. словазлучэннях. Шматскладовыя С.с. могуць мець дадатковы націск («рыбало́ў», але «ле́санарыхто́ўшчык»). Да С.с. адносяцца і падваенні («сіні-сіні», «ледзь-ледзь»).

Літ.: Шакун Л.М. Словаўтварэнне. Мн., 1978; Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985.

А.Я.Міхневіч.

СКЛАДАНАЗАЛЕ́ЖНЫ СКАЗ, адзін з відаў *складанага сказа*.

СКЛАДАНАКВЕ́ТНЫЯ, астравыя (Compositae, або Asteraceae), сямейства двухдольных раслін парадку астравых. Найб. арганізаваныя прадстаўнікі вышэйшых раслін. Адзін з гал. ачагоў развіцця С. — сухія нагор'і Цэнтр. Мексікі. Удзельнічаюць у фарміраванні расл. покрыва ў паўпустынях, альпійскім поясе тропікаў і інш. Больш за 1 тыс. родаў, каля 30 тыс. відаў. Пашыраны паўсюдна. На Беларусі каля 250 відаў з 60 родаў. Буйнейшыя — *бадзяк, васілёк, дзівасіл, зубнік, крываўнік, палын, пупок, старасцень, чартапалох, ястрабок*. У садах і парках, радзей у пакоях культывуюцца каля 20 відаў з 12 родаў (напр., *аксаміткі, вяргіня, пірэтрум, рудбекія*).

Адна- і шматгадовыя травы, радзей кусты, паўкусты і дрэвы (у тропіках). Лісце простае, чаргаванае ці супраціўное без прылісткаў. Для вегетатыўных органаў характэрны млечнікі або смаляныя хады. Трубчастыя кветкі размешчаны ў цэнтры кветаложа, афарбаваныя язычковыя — па краі. Суквецце — кошык, які мае ад аднаго (*мардоўнік*) да 1 тыс. і больш (*сланечнік*) кветак. Звычайна кошыкі сабраны ў разнастайныя верхавінкавыя суквецці (мяцёлчатыя, шчыткападобныя і інш.). Плод — сямянка. Сярод С. алейныя (напр., *сафлор*, сланечнік), агароднінныя (напр., *артышок, салата*), лек. (напр., *каляндула, піжма, рамонак*, палын, дэкар. (напр., *астра, вяргіня, хрызантэма*) расліны, некат. пустазелле [напр., *амброзія, асот, галінзога* (амерыканка), *лапух*, чартапалох].

А.М.Скуратовіч.

СКЛАДА́ННЕ, арыфметычнае дзеянне, якое дае магчымасць па дадзеных цэлых дадатных ліках *a* і *b* (складаемыя) знайсці новы лік *c* (сума), у якім столькі адзінак, колькі іх маюць складаемыя: $c = a+b$.

С. лікаў уласцівы *асацыятыўнасць*: $(a + b) + c = a + (b + c)$ і *камутатыўнасць*: $(a + b) = (b + a)$. С. дастасавальна для адвольных сапраўдных лікаў, камплексных лікаў, а таксама да вектараў, матрыц, мностваў.

СКЛАДА́НЫ СКАЗ, поліпрэдыкатыўная сінтаксічная адзінка, арганізаваная з двух і больш *простых сказаў*, аб'яднаных у структурнае, сэнсавае і інтанацыйнае адзінства. У С.с. простыя сказы страчваюць уласцівую ім грамат., інтанацыйную, сэнсавую самастойнасць і ператвараюцца ў састаўныя ўзаемна звязаныя прэдыкатыўныя часткі, якія дапаўняюць або характарызуюць адна адну. Сінтакс. сувязь гэтых частак ажыццяўляецца злучнікавым або бяззлучнікавым спосабам, а таксама інтанацыяй і структурнымі іх суадносінамі.

Паводле сродкаў сувязі С.с. падзяляюцца на злучнікавыя, бяззлучнікавыя і камбінаваныя. Сярод злучнікавых вылучаюць складаназлучаныя і складаназалежныя сказы. У складаназлучаных сказах прэдыкатыўныя часткі сінтаксічна раўнапраўныя, аб'яднаны здучальнымі злучнікамі і выражаюць спалучальныя, супастаўляльныя, размеркавальныя і розныя віды далучальных адносін: «Ці то сонца свеціць, ці то месяц ясны вам смяецца з неба весела і шчасна» (Я.Купала). У адпаведнасці з будовай і характарам выражаных адносін складаназлучаныя сказы могуць мець адкрытую або закрытую структуру. У складаназалежных сказах прэдыкатыўныя часткі сінтаксічна нераўнапраўныя, аб'яднаны падпарадкавальнымі злучнікамі і выражаюць працэсуальныя, суб'ектныя, аб'ектныя, атрыбутыўныя і розныя віды акалічнасных адносін: «Пад акном роўна шумелі старыя ліпы, якія жывой сцяной акружалі сад» (І.Шамякін). Незалежна ад колькасці і разнавіднасці прэдыкатыўных частак складаназалежныя сказы заўсёды маюць закрытую структуру. Бяззлучнікавыя С.с. арганізаваны з сінтаксічна раўнапраўных або нераўнапраўных прэдыкатыўных частак, аб'яднаных бяззлучнікавай сувяззю, якая рэалізуецца інтанацыяй, парадкам слоў, трывальна-часавымі суадносінамі выказнікаў і інш. лексіка-грамат. сродкамі: «Маўчала ноч па-над палянай, зялёны гай не гаманіў» (П.Трус). Укамбінаваныя С.с. ўваходзяць тры і больш прэдыкатыўныя часткі, якія па-рознаму пабудаваны і аб'яднаны рознымі відамі злучнікавай і бяззлучнікавай сувязі. У выніку іх аб'яднання звычайна ўтвараюцца С.с., якія арганізуюцца паводле мадэлі складаназлучаных, складаназалежных або бяззлучнікавых сказаў. «На дварэ цёпла — дзеці гуляюць каля хаты, а стане халадней — яны ідуць у хату» (З.Бядуля).

Літ.: Беларуская граматыка. Ч. 2. Сінтаксіс. Мн., 1986; Бурак Л.І. Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя. Мн., 1987.

Л.І.Бурак.

СКЛАДА́НЫЯ РЭА́КЦЫІ, хімічныя рэакцыі, у якіх канчатковыя прадукты ўтвараюцца з зыходных рэчываў у выніку некалькіх (2 і больш) простых (элементарных) стадый (рэакцый). Асобныя стадыі С.р. прыводзяць да ўтварэння ці ператварэння прамежкавых рэчываў (малекул, свабодных атамаў, радыкалаў і інш.), што не ўваходзяць у састаў прадуктаў рэакцыі. Да С.р. адносяць найб. пашыраныя класы рэакцый — каталітычныя (гл. *Каталіз*), *ланцуговыя хімічныя рэакцыі*, а таксама *абарачальныя рэакцыі*.

Паводле характару ўзаемасувязі элементарных рэакцый адрозніваюць: паралельныя рэакцыі, у якіх з аднолькавых зыходных рэчываў у выніку розных элементарных рэакцый, што адбываюцца адначасова, утвараюцца розныя прадукты (напр., пры хлараванні бензолу ўтвараецца сумесь *орта-, мета-* і *пара*-хлорбензолу); паслядоўныя рэакцыі, калі прадукт папярэдняй элементарнай рэакцыі з'яўляецца зыходным рэчывам наступнай (напр., пры хлараванні метану CH_4 паслядоўна ўтвараюцца метылхларыд CH_3Cl, метыленхларыд CH_2Cl_2, трыхлорметан $CHCl_3$, тэтрахлорметан CCl_4); паслядоўна-паралельныя і інш. Гл. таксама *Кінетыка хімічная, Рэакцыі хімічныя*.

СКЛАДА́НЫЯ ЎГНАЕ́ННІ, адзін з відаў *комплексных угнаенняў*.

СКЛАДАПАДЗЕ́Л, вызначэнне межаў паміж *складамі* ў слове і на стыках слоў. Пры ўспрыманні слова на слых колькасць складоў у ім вызначаецца лёгка, аднак межы паміж імі могуць расстаўляцца па-рознаму. На пісьме С. ужываецца для правільнага пераносу частак слоў. С. адбываецца паводле прынцыпаў: павелічэння гучнасці (прапанаваны Р.І.Аванесавым), які ўлічвае слыхавыя якасці гукаў — зычныя, якія папярэднічаюць пры пабудове складоў галоснаму, заўсёды ствараюць з ім паслядоўнасць з павелічэннем гучнасці («ва-пна»); мускульнага напружання (прапанаваны Л.У.Шчэрбам), у аснове якога артыкуляцыйна-фізіял. адрозненні зычных гукаў. Міжскладовай мяжой лічыцца месца найб. напружання, звычайна пры вымаўленні галоснага («вап-на», «шап-ка»); вераднасці складу (прапанаваны М.В.Ламаносавым), які дазваляе пакідаць збег зычных у складзе, калі ў лексіцы ёсць словы з такімі спалучэннямі зычных у пачатку («да-звол» — ёсць бел. слова «зварот»; «ка-лгас» нельга, бо з пачатковым «лг» бел. слоў няма); імкнення да адкрытых складоў, калі зычны гук незалежна ад яго якасці, месца націску ў слове і аддаленасці ад наступнага галоснага акустычна звязаны з наступным галосным мацней, чым з папярэднім («ка-лга-сы», «вы-раз-на»); псіхалінгвістычнага, што тлумачыць пэўны несвядомы (рознымі людзьмі па-рознаму) падзел спалучэнняў зычных пры пераносе слоў з радка ў радок («шап-ка», «ша-пка»). У бел. мове пашыраны прынцып С. ў адпаведнасці з павелічэннем гучнасці. Калі ў слове апошні гук галосны, а зычныя і галосныя гукі размешчаны па чарзе, С. праводзіцца паміж галосным і наступным зычным («ба-ра-на-ва-лі»). Калі паміж галоснымі ёсць спалучэнне шумных зычных ці шумнага і санорнага, С. праводзіцца перад першым зычным гэтага спалучэння («мя-тла»). Калі паміж галоснымі ёсць спалучэнні санорных зычных, санорнага, «й» і «ў» з шумным, С. праходзіць паміж зычнымі («гал-ка», «пам-рэ»). Спалучэнні зычных гукаў у пачатку і ў канцы слова

(незалежна ад тыпу зычных) цалкам адносяцца да складу, утворанага суседнім галосным гукам («зра-бі-ла», «ка-лібр»). С. на стыку марфем праводзіцца паводле агульнага прынцыпу, таму падзел слова на марфемы («пад-ыгр-а-л-і») можа не супадаць з падзелам на склады («па-ды-гра-лі»).

Літ.: Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985. *Г.В.Лосік.*

СКЛА́ДЗЕНЬ, складны абраз, або т.зв. машчавік з двух (дыпціх), трох (трыпціх) ці больш (паліпціх) частак-створак. Выконваецца ў тэхніках тэмпернага жывапісу, разьбы па косці або дрэве, у метале з выкарыстаннем чаканкі, філіграні, эмалі і інш.

Жывапісныя С. належаць да стараж.-візант. літургічнай традыцыі. У зах.-еўрап. мастацтве позняй готыкі, Адраджэння, барока пашырыліся алтарныя С., якія аб'ядноўвалі жывапіс і скульптуру (напр., С. М.Пахера ў царкве г. Санкт-Вольфганг, Аўстрыя, 1471—81); скульптурныя (напр., драўляны С. В.Ствоша ў касцёле Дзевы Марыі ў г. Кракаў, Польшча, 1477—89); жывапісныя (напр., «Алтар Ільдэфонса» П.П.Рубенса, 1632). У Расіі з 15 ст. пашыраны мініяцюрныя, медналітыя, выразаныя з дрэва ці косці С. з гравіроўкай, залатой і сярэбранай сканню (трыпціх майстра Лукіяна, 1412—13, і інш).

На Беларусі С. меў вял. пашырэнне ў правасл. (напр., С. «Наталля. Маці Божая Адзігітрыя. Рафаіл», 1760) і старавераскіх храмах (шматстворкавыя метал. С., аздобленыя выемчатай каляровай эмаллю 17—20 ст.).

Да арт. **Складзень**. Наталля. Маці Божая Адзігітрыя. Рафаіл. Беларуская школа. 1760.

СКЛА́ДКАВАСЦЬ ГО́РНЫХ ПАРО́Д, сукупнасць складак горных парод розных участкаў зямной кары (напр., альпінатыпная або германатыпная складкавасць). Адрозніваюць С.г.п., якія ўтварыліся ў розныя эпохі тэктагенезу (напр., байкальская, каледонская, герцынская, кімерыйская, альпійская; гл. адпаведныя арт.). Таксама С.г.п. наз. працэс фарміравання складак горных парод (складкаўтварэнне).

СКЛАДКАВАТАКРЫ́ЛЫЯ ВО́СЫ, гл. *Сапраўдныя восы.*

СКЛА́ДКАВАЯ ВО́БЛАСЦЬ ПАЎДНЁВА-АМЕРЫКА́НСКІХ КАРДЫЛЬЕ́Р, складкавая вобласць Андаў, Андыйскі складкавы пояс, частка складанага рухомага *Ціхаакіянскага геасінклінальнага пояса* зямной кары, якая акаймоўвае Паўд. Амерыку на З і Пн. На Пн сучляняецца са *складкавай вобласцю Паўночна-Амерыканскіх Кардыльераў*, на Пд — з *Заходне-Антарктычнай складкавай вобласцю*. Складзена з сістэм мерыдыянальных (на Пн — шыротных) хрыбтоў: Усходніх, Цэнтральных, Заходніх, Карыбскіх і Патагонскіх Андаў, паміж якімі ляжаць унутр. плато або ўпадзіны. Развіваецца з позняга пратэразою. Вял. значэнне ў фарміраванні вобласці мела эпоха *герцынскай складкавасці*. Моцныя арагенічныя працэсы адбываліся і ў мелавы перыяд. У эпоху *альпійскай складкавасці* (з канца мелу) уздоўж новаўтвораных антыклінорыяў ішло ўкараненне гранітных баталітаў. Найб. актыўны цыкл гораўтварэння адбываецца з канца палеагену (30 млн. г. назад) да нашага часу. У альпійскую эпоху ўтварыліся Карыбскія і Патагонскія Анды, інтэнсіўна праявіўся наземны вулканізм, які працягваецца. Буйныя радовішчы медзі (Чылі), волава, вальфраму і інш. рэдкіх і каляровых металаў (Перу, Балівія), нафты і газу (Венесуэла, Эквадор, Аргенціна і інш.). *В.М.Губін.*

СКЛА́ДКАВАЯ ВО́БЛАСЦЬ ПАЎНО́ЧНА-АМЕРЫКА́НСКІХ КАРДЫЛЬЕ́РАЎ, частка складанага рухомага *Ціхаакіянскага геасінклінальнага пояса* зямной кары, выцягнутая ўздоўж зах. ускраіны Паўн. Амерыкі ў выглядзе сістэм складкавых гор (Кардыльеры Паўночнай Амерыкі). Уключае 4 структурныя сегменты: Аляскінскі, Канадскі, ЗША і



Мексіканскі, для якіх характэрны 2 падоўжныя зоны — міягеасінклінальная (пояс Скалістых гор) і эўгеасінклінальная (Ціхаакіянскі пояс).

Міягеасінкліналь з позняй юры (невадыйская эпоха) уцягваецца ў інтэнсіўныя складкава-насоўныя дэфармацыі. У канцы мелу — пач. палеагену (ларамійская эпоха) складкаўтварэнне адбывалася ва ўсх. ч. Скалістых гор і прылеглых раёнах Паўн.-Амерыканскай платформы. У выніку актывізацыі тэктонамагматычных працэсаў у Кардыльерах Канады і ЗША узнікла серыя падняццяў фундамента, што абумовіла фарміраванне плато *Каларада*. Заключныя дэфармацыі і буйныя насовы ларамійскага ўзросту адзначаны на Алясцы (хр. Брукс) і ў Мексіцы (Усх. Сьера-Мадрэ). Складаная ўнутр. будова эўгеасінклінаді з зонамі меланжу, насовамі і ссовамі пачала развівацца ў пярмі і дасягнула кульмінацыі ў мелавы перыяд. У кайназоі на З вобласці былі пашыраны рыфтаўтварэнне (рыфты Рыо-Грандэ і Каліфарнійскага зал. ў Кардыльерах ЗША, на З Аляскі) і інтэнсіўны вулканізм, які працягваецца ў межах Алеуцкай дугі, Аляскінскага хр., Каскадных гор, Трансмексіканскага вулканічнага пояса.

Шматлікія радовішчы нафты і газу (больш за 2 тыс.; у ЗША, Мексіцы, на шэльфе Мексіканскага зал.), медзі (ЗША, Канада, Мексіка), урану (плато Каларада) і інш. *В.М.Губін.*

СКЛА́ДКІ горных пародаў, структурныя формы зямной кары, утвораныя выгінамі пластоў горных парод без разрыву іх суцэльнасці. Часцей трапляюцца групамі з чаргаваннем дадатных (*антыкліналі*) і адмоўных (*сінкліналі*) выгінаў. Маюць элементы: крылы, ядро, замок, восевую паверхню, вось, шарнір, вугал; дадаткова ў антыкліналях — скляпенне, грэбень, перыкліналь; у сінкліналях — мульду, кіль, цэнтрыкліналь. У залежнасці ад механізму геал. працэсаў ці месца ўтварэння вылучаюць генетычныя типы С.: глыбінныя (магматагенныя і метамарфагенныя С.); паверхні фундамента і адлюстраваныя С. яго чахла (унаследаваныя, надразломныя, прыразломныя, міжразломныя); покрыўныя асадкавага чахла, звязаныя з рухамі фундамента (нагнятання, дыяпіравыя, валачэння, гравітацыйныя); паверхневыя (экзагенныя) — С. асадкавага аблягання, ушчыльнення, разбухання, выпірання, асядання, апаўзання, гляцыяльныя. Паводле дынамічнага стану геал. асяроддзя вылучаюць дынамічныя типы С.: тангенцыяльнага (гарызантальнага) сціскання і тангенцыяльнага расцяжэння. У залежнасці ад механізму ўтварэння паверхневых С. вылучаюць іх кінематычныя типы: глыбавыя, або штампавыя (не дыяпіравыя перарывістыя і скрыневыя), нагнятання (*дыяпіравыя купалы* і антыкліналі, грэбенепадобныя і агульнага змінання). Адрозненне параметраў (формы, будовы, распасціранне восі, нахілу восевай паверхні і г.д.), незалежна ад паходжання, вызначае разнастайнасць марфалагічных тыпаў С.: паводле нахілу восевай паверхні — прамыя, нахіленыя, абернутыя, ляжачыя, перавернутыя; паводле формы замка і кірунку падзення крылаў — вуглаватыя, плаўныя, кілепадобныя, грэбенепадобныя, веерападобныя, каробчатыя; паводле вугла С. — вострыя, тупыя, закрытыя, адкрытыя; паводле даўжыні і шырыні — лінейныя, *брахіантыкліналі, брахісінкліналі* і *купалы (мульды)*; паводле памераў і складанасці будовы — мегантыкліналі і мегасінкліналі, антыклінорыі і сінклінорыі, мегантыклінорыі і мегасінклінорыі і інш. *І.В.Клімовіч.*

СКЛАДО́ВАЕ ПІСЬМО́, тып пісьма, у якім паасобныя склады абазначаюцца графічнымі знакамі.

Развілося са стараж. сістэм пісьма на аснове фонаідэаграфіі (японскае С.п. кана), а таксама алфавітнага пісьма кансанантнага тыпу (пісьмо брахмі ў Індыі; кожны знак адпавядае адкрытаму складу з пэўным зычным, але форма знака крыху зменьваецца ў залежнасці ад таго, які галосны ў складзе). У знакі С.п. ператварыліся ідэаграмы, якія напачатку абазначалі аднаскладовыя словы. С.п. пашырана ў Індыі, Эфіопіі, М'янме, Тайландзе, Камбоджы, Карэі, Японіі.

Літ.: Гл. да арт. *Пісьмо.* *А.М.Булыка.*

СКЛАДО́ЎСКАЯ-КЮРЫ́ (Skłodowska-Curie) Марыя (7.11.1867, Варшава — 4.7.1934), фізік і хімік, адзін са стваральнікаў вучэння аб радыеактыўнасці. Замежны чл.-кар. Пецярбургскай АН

М.Складоўская-Кюры.

(1907), ганаровы чл. АН СССР (1926). Па паходжанні полька, з 1891 у Францыі. Маці І.*Жаліо-Кюры*. Скончыла Парыжскі ун-т (1894), дзе і працавала (з 1906 заг. кафедры). З 1914 заг. фізікахім. аддзела Ін-та радыю ў Парыжы. Навук. працы па радыеактыўнасці і яе выкарыстанні. Выявіла радыеактыўнасць торыю, з мужам П.*Кюры* адкрыла хім. элементы палоній і радый (1898), даследавала ўласцівасці радыеактыўных рэчываў і дзеянне радыеактыўнага выпрамянення, увяла тэрмін «радыёактыўнасць». Разам з франц. хімікам А.Дэб'ернам атрымала металічны радый і даследавала яго ўласцівасці (1910). У гонар С.-К. і П. Кюры названы адзінка актыўнасці радыенуклідаў *кюры* і хім. элемент *кюрый*. Нобелеўскія прэміі па



Складкі горных парод: 1 — антыклінальная; 2 — сінклінальная; 3 — асіметрычная; 4 — нахіленая; 5 — ляжачая; 6 — веерападобная; 7 — ізаклінальная; Я — ядро складкі; К — крыло складкі; 3 — замок складкі.

фізіцы 1903 (разам з П.Кюры і А.А.*Бекерэлем*) і па хіміі 1911.

Тв.: Рус. пер. — Радиоактивность. 2 изд. М., 1960.

Літ.: Староселькая-Никитина О.А. История радиоактивности и возникновения ядерной физики. М., 1963; 100 лет со дня рождения Марии Кюри. М., 1968; Кюри Е. Мария Кюри: Пер. с фр. 4 изд. М., 1979.

СКЛАНЕ́ННЕ, 1) катэгарыяльная адзнака іменных часцін мовы; змяненне па *склонах*, абумоўленае сінтаксічнымі сувязямі адпаведных слоў у пэўным кантэксце. 2) Тып формазмянення. Сістэма склонавых форм у пэўным тыпе наз. *парадыгмай* С. Вылучаюць субстантыўнае (назоўнікавае) і ад'ектыўнае (прыметнікавае) С.

С. ад'ектыўных разрадаў слоў (прыметнікаў, парадкавых лічэбнікаў, абагульнена-якасных займеннікаў, дзеепрыметнікаў) у параўнанні з субстантыўнымі (назоўнікамі, колькаснымі лічэбнікамі, абагульнена-прадметнымі займеннікамі) больш уніфікаванае і менш разнастайнае па формах выражэння склонавых значэнняў.

3) Група назоўнікаў, аб'яднаных агульнасцю ўтварэння склонавых форм.

Вылучаюць 3 тыпы С. Да 1-га С. адносяцца назоўнікі мужчынскага і ніякага роду (тыпу «дол», «сяло»), да 2-га — назоўнікі жаночага роду (тыпу «вада», «зямля»), да 3-га — назоўнікі жан. роду (тыпу «ноч», «даль»). Асобныя групы складаюць назоўнікі агульнага і мужчынскага роду (тыпу «сірата», «ваявода»), рознаскланяльныя (тыпу «дзіця», «імя») і нескланяльныя назоўнікі (іншамоўнага паходжання, некат. прозвішчы асоб жаночага і мужчынскага полу і інш.), склонавыя значэнні якіх вызначаюцца грамат. формамі дапасаваных да іх слоў ці сінтакс. сувяззю кіравання («маё амплуа», «нашага аташэ», «сустрэў Гурло», «пазнаёміўся з Баранавых» і інш.).

Літ.: Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985; Шуба П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія. Мн., 1987.

А.І.Наркевіч.

СКЛЕП (ад польск. sklep скляпенне, падвал), 1) гаспадарчая пабудова для захоўвання гародніны, бульбы, квашаніны і інш. прадуктаў. Шырока бытуе ў народаў Еўропы, Зах. Азіі, Каўказа, Сібіры і інш. На Беларусі архітэктура С., а таксама назвы (пограб, пограбня, прыгрэбка, лёх і інш.) атрымалі рэгіянальныя асаблівасці. С. мае заглыбленую на 1,5—2 м падземную ч. са сценамі з камення, бетону (раней — з бярвён), над якой робяць зруб з 3—4 вянкоў, накрываюць 2- ці 3-схільным дахам. Перакрыцце з дошак па бэльках ці маналітнае з бетону, абавязкова з ацяпленнем. Знадворку робяць квадратны люк і невял. адтуліну («варонку») для засыпання бульбы і інш. Уваход у С. заўсёды ў тарцовай сцяне. Звычайна С. ставяць каля хаты, часам ён з'яўляецца падземнай ч. клеці. Здаўна С. вядомы і пад падлогай жылых памяшканняў, часцей у сенцах, каморы, пазней — у кухнях і на верандах. Пры высокім узроўні падземных вод С. робяць неглыбокім, са сценамі, прысыпанымі для ацяплення зямлёй, ці будуюць далей ад сядзібы на сухім месцы. 2) Падземнае збудаванне ў замках, палацах, мураваных будынках ці натуральная пячора, прыстасаваная для доўгатэрміновага захоўвання віна, пораху, прадуктаў, часам для трымання і катавання вязняў. 3) Мемар. збудаванне на могілках, дзе хаваюць нябожчыка. Мае невял. (у параўнанні з грабніцай ці пахавальняй) памеры, абавязкова з унутр. прасторай, звычайна з падземнай ч. і з уваходам у яе. С. для пахавання выкарыстоўваюцца са старажытнасці. Характарызуюцца манументальнасцю форм, разнастайнасцю і багаццем дэкар. аздаблення (С. на Кальварыйскіх і Вайсковых могілках у Мінску, канец 19 ст.). 4) Падземная ч. пахавальні ці буйнога культавага збудавання, *крыпта* якога прызначаецца для пахавання (Нясвіжскі касцёл езуітаў, 16 ст.).

С.А.Сергачоў.

СКЛЕ́РА (ад грэч. sclēros цвёрды, шчыльны), вонкавая шчыльная злучальнатканкавая абалонка *вока*, якая выконвае апорную і ахоўную функцыі. Непразрыстая, укрывае заднюю ч. вочнага яблыка, пярэдняя ч. ўкрыта кан'юнктывай і пераходзіць у празрыстую рагавіцу.

У С. існуюць шматлікія каналы, па якіх праходзяць сасуды і нервы (эмісарыі). Знутры да С. прылягае сасудзістая абалонка. З суседнімі ч. вочнай упадзіны С. звязана рыхлай і багатай сасудамі тканкай, якая забяспечвае рухомасць вочнага яблыка. Пярэднюю белую ч. С., бачную паміж павекамі, наз. бялком вока.

А.С.Леапюк.

СКЛЕРАДЭРМІ́Я, дэрматасклероз, пашкоджанне скуры, якое характарызуецца яе дыфузным або абмежаваным ушчыльненнем з далейшым развіццём *фіброзу* і *атрафіі* пашкоджаных участкаў.

Адрозніваюць ачаговую (пашкоджваецца толькі скура) і сістэмную С. (пашкоджваецца скура, слізістыя абалонкі, унутр. органы). Пры ачаговай С. вылучаюць 3 стадыі: ацёкавая эрытэма (пачырваненне скуры), склероз (скура шчыльная, колеру слановай косці) і атрафія са стратай валасоў. Лячэнне комплекснае.

М.З.Ягоўдзік.

СКЛЕРАЇ́ДЫ, тое, што *камяністыя клеткі*.

СКЛЕРАНХІ́МА (ад грэч. sklēros цвёрды, шчыльны + enchyma налітае, тут тканка), механічная тканка раслін, якая складаецца з таўстасценных клетак 2 тыпаў — валокны і *камяністыя клеткі* (склераіды). Валокны — моцна выцягнутыя празенхімныя клеткі даўж. ад некалькіх дзесятых міліметра да 4 см (рамі) з завужанымі канцамі, слаістымі порыстымі сценкамі і поравымі каналамі. Забяспечваюць трываласць органаў раслін на расцяжэнне, сціскванне, выгін. У многіх раслін валокны складаюць мех. абкладку праводных пучкоў. Неадраўнелыя валокны С. з цэлюлознымі сценкамі (напр., у джута, канопель, лёну) — сыравіна для тэкст. прам-сці.

СКЛЕРАТЫНІЁЗЫ, хваробы раслін, што выклікаюцца грыбамі, у цыкле развіцця якіх ёсць *склероцыі*. Найб. шкаданосныя белая гніль агуркоў, морквы, пятрушкі, сельдэрэю, лубіну, фасолі і інш. культур, рак канюшыны (гл. *Рак раслін*). На Беларусі пашыраны таксама С. азімых збожжавых, узбуджальнік якога (склератынія злакавая) пашко-

Скляпы на вясковых могілках каля г. Жбейль (Ліван).

Склеп на Вайсковых могілках у Мінску.



Склеп у вёсцы Радунь Карэліцкага раёна Гродзенскай вобл.

Склеп у вёсцы Дзямянчыцы Камянецкага раёна Брэсцкай вобл.

джвае жыта, пшаніцу, цімафееўку, лісахвост і інш.

Паразіт заражае пасевы азімых увосень і зімуе ў тканках раслін у выглядзе грыбніцы. Вясной на лісці хворых раслін паяўляецца шараваты, камякаваты налёт міцэлію. Пазней унутры сцёблаў пад эпідэрмісам і каля асновы ліста ўтвараюцца склероцыі, якія ўвосень прарастаюць і заражаюць пасевы азімых.

СКЛЕРАТЫ́НІЯ (Sclerotinia), род сумчатых грыбоў сям. склератыніевых. Каля 15 відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ва ўмераным поясе. Паразіты травяністых раслін, большасць — на раслінах сям. асаковых. Выклікаюць *склератыніёзы*. На Беларусі найб. пашыраны С. склерацыйная (S.sclerotiorum), узбуджальнік белай гнілі с.-г. культур, і С. канюшынавая (S.trifoliorum), узбуджальнік рака канюшыны.

Цыкл развіцця мае 2 стадыі: на першай утвараюцца *склероцыі*, што служаць для перазімоўкі грыба, на другой — міцэлій або пладовыя цялы (*апатэцыі*). Міцэлій шматклетачны, белы, лямцавы, знаходзіцца на паверхні расліны або ўнутры пашкоджаных органаў. На ім развіваюцца склероцыі, якія вясной прарастаюць міцэліем або некалькімі жаўтаватакарычневымі апатэцыямі дыяметрам да 10 мм. Канідыяльнае спаранашэнне адсутнічае.

С.І.Бельская.

СКЛЕРАФІ́ТЫ (ад грэч. sklēros цвёрды, шчыльны + ... *фіт*), засухаўстойлівыя (ксерафільныя) расліны з шорсткімі парасткамі. Шорсткасць сцёблаў і лісця абумоўлена моцным развіццём мех. тканак, таму пры водным дэфіцыце ў раслін адсутнічаюць прыкметы завядання. З траў да С. адносяць дурнічнік калючы, сінегаловік палявы, кавылі; з кустовых раслін — ігліцу пантыйскую, саксаул і інш.

С. нырак (*нефрасклероз*), лёгкіх (*пнеўмасклероз*), печані (*цыроз печані*). Асобная форма С. — *рассеяны склероз*.

СКЛЕРО́МА (ад грэч. sklērōma ушчыльненне), хранічнае інфекцыйнае захворванне з утварэннем у сценках верхніх дыхальных шляхоў (пераважна носа) *гранулём*. Узбуджальнік — клебсіела (палачка Валковіча-Фрыша). Інфекцыя перадаецца кропельным або кантактна-бытавым шляхам.

Прыкметы: сухасць у носе і глотцы, закладванне слёзаю і коркамі, непраходнасць дыхальных шляхоў, бывае пашкоджанне слёзных шляхоў, слыхавых праходаў, зроку. Другасныя змены пры С. — хранічны бранхіт, пнеўмасклероз і інш. Лячэнне: тэрапеўт., хірург., прамянёвае.

І.М.Семяненя.

СКЛЕРО́МЕТР (ад грэч. sklēros цвёрды, шчыльны + ...*метр*), прылада для вымярэння цвёрдасці металаў, крышталяў, пакрыццяў і інш. матэрыялаў. Засн. на метадах драпін і ўціскання. Цвёрдасць матэрыялу вызначаюць нагрузкай, пры якой застаецца драпіна пэўнай шырыні або ўціснутасць пэўнай плошчы.

СКЛЕРО́ЦЫЙ (ад грэч. sklērotēs цвёрдасць), шматклетачны вегетатыўны орган грыба, што знаходзіцца ў спакоі. Утвораны шчыльным спляценнем гіфаў, мае шарападобную ці няправільную форму, часта з цёмным верхам і белым асяродкам, памерам ад долей міліметра да 2 см і больш. Прызначаны для захоўвання грыба, утвараецца пры неспрыяльных умовах. У некат. грыбоў (напр., *склератынія*, батрыціс, спарынія) — адна са стадый жыццёвага цыкла.

Склератыніёзы: 1 — жыта; 2 — фасолі; 3 — морквы; 4 — буракоў; 5 — сельдэрэю; 6 — цімафееўкі.

СКЛЕРО́З (ад грэч. sklērōsis зацвярдзенне), паталагічнае ўшчыльненне тканкі ці органа, выкліканае гібеллю функцыян. элементаў і заменай іх злучальнай тканкай. Бывае С. дыфузны (агульнае пашкоджанне органа) і ачаговы (частковае пашкоджанне). Адрозніваюць *атэрасклероз*, *кардыясклероз*,

СКЛІФАСО́ЎСКІ Мікалай Васілевіч (6.4.1836, г. Дубэсар, Малдова — 13.12.1904), расійскі хірург. Д-р медыцыны (1863). Скончыў Маскоўскі ун-т (1859). З 1870 праф. Кіеўскага ун-та, з 1871 пецярб. Медыка-хірургічнай акадэміі, з 1880 Маскоўскага ун-та, у 1893—1900 дырэктар Ін-та удасканальвання ўрачоў у Пецярбургу. Удзельнік войнаў: аўстра-прускай (1866), франка-прускай (1870—71), руска-турэцкай (1877—78). Навук. працы па пытаннях ваенна-палявой хірургіі, траўматалогіі, хірургіі органаў брушной поласці. Прапанаваў метад злучэння касцей — «рускі замок» («замок С.»); распрацаваў метады лячэння мазгавых грыж. Прапанаваў і ўкараніў у хірург. практыку асептыку і антысептыку. Яго імем названы НДІ хуткай мед. дапамогі ў Маскве.

Тв.: Избр. труды. М., 1953.

СКЛОН, граматычная словазмяняльная катэгорыя іменных часцін мовы, якая служыць для сінтакс. адносін з інш. словамі ў складзе словалучэнняў ці сказаў. У бел. мове 6 склонаў: назоўны (прамы), родны, давальны, вінавальны, творны, месны (ускосныя). Сустракаецца ўстарэлая *клічная форма*.

Кожнай склонавай форме ўласціва пэўнае грам. значэнне. Напр., формай назоўнага склону выражаецца значэнне суб'екта дзеяння («прыйшла **вясна**»), формамі ўскосных — аб'екта дзеяння («будаўніцтва **школы**», «падарунак **дзецям**»), прыналежнасці («хата **рыбака**»), якаснай ацэнкі («дзяўчына **з гонарам**»), спосабу дзеяння («жніво **камбайнам**»), месца («праца**ваць у лесе**»), часу («адпачыць пасля **працы**») і інш.

Найб. семантычна ёмкія і прадуктыўныя ва ўжыванні родны, вінавальны, творны і месны С. Назоўны і давальны больш абмежаваныя па значэннях і канструктыўна. С. прыметнікаў, парадкавых лічэбнікаў, абагульнена-якасных займеннікаў, дзеепрыметнікаў залежыць ад С. назоўніка і самастойнага значэння не мае.

Літ.: Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985; Шуба П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія. Мн., 1987.

А.І.Наркевіч.

СКЛЮТ Іосіф Абрамавіч (н. 6.5.1924, Мінск), бел. вучоны ў галіне атаневралогіі. Д-р мед. н. (1971), праф. (1975). Засл. дз. нав. Беларусі (1998). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1953), з 1954 у НДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі (кіраўнік лабараторыі). Навук. працы па пытаннях паталогіі вестыбулярнай і слыхавой функцый пры пашкоджаннях галаўнога мозга, ужыванні электраністагмаграфіі. Распрацаваў спосаб даследавання вестыбулярнай функцыі.

Тв.: Невриномы слухового нерва. Мн., 1970 (разам з Э.І.Злотнікам); Нистагм. Мн., 1990 (разам з С.Р.Цемахавым); Вестибулярный рекруитмент. Мн., 1990 (з ім жа); Автоматизированный анализ вестибулосоматических и вегетативных реакций. Вильнюс, 1990 (разам з В.Піўрыкасам, А.Жукаўскасам).

СКЛЯЗНЁЎ Георгій Міхайлавіч (2.2.1911, г. Гомель — 12.2.1937), Герой Сав. Саюза (1937). Вучыўся ў Маскоўскім вышэйшым вучылішчы, скончыў Горкаўскае тэхн. вучылішча (1934). Працаваў на буд-ве Гомельскага лесакамбіната (з 1929). У Чырв. Арміі з 1932. Удзельнік вайны ў Іспаніі 1936—

39; камандзір танк. ўзвода лейтэнант С. вызначыўся ў баях супраць франкістаў; загінуў у гэтай вайне. Імем С. названа вуліца ў Гомелі.

СКЛЯПЕ́ННЕ, нясучая прасторавая канструкцыя для перакрыцця ці пакрыцця збудаванняў, якая мае крывалінейную паверхню. Можа быць з цэглы, прыроднага каменю, жалезабетону, дрэва. Пад нагрузкай працуе пераважна на



Скляпенні: а — цыліндрычнае; б — самкнутае; в — люстранае; г — рабрыстае жалезабетоннае; д — скляпенні-абалонкі; е — бочкападобнае; ж — крыжовае; з — ветразевае.

сцісканне, перадае на апоры верт. і гарыз. намаганні. Бываюць рознай формы. Разнавіднасць С. — *купал*. У манум. архітэктуры Беларусі вядомы з 11—12 ст. Цыліндрычныя С. з малымі пралётамі ўжыты ў Спаса-Праабражэнскай царкве Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра, Гродзенскай Барысаглебскай царкве і інш. У гатычных збудаваннях асобныя прасторавыя ячэйкі (травеі) паміж слупамі і сценамі перакрываліся крыжовымі і нервюрнымі С. (зорчатымі, сотавымі). З 2-й пал. 16 ст. пашырыліся цыліндрычныя С. з распалубкамі, якія перакрывалі вял. пралёты, часам былі аздоблены ляпнымі кесонамі ці размалёўкай (Нясвіжскі касцёл езуітаў). Культавыя збудаванні ў стылі барока мелі звычайна цыліндрычныя С. з распалубкамі на падпружных арках у сярэднім нефе і крыжовыя С. ў бакавых. Над сяродкрыжжам рабілі купалы. У палацавым буд-ве ў перыяд барока і класіцызму шырока выкарыстоўваліся люстраныя С. У сучасным буд-ве адным з новых тыпаў пакрыцця з'яўляюцца жалезабетонныя танкасценныя С.-*абалонкі* рознай геам. формы (цырк у Гомелі, Камароўскі крыты рынак у Мінску і інш.). *Т.В.Габрусь.*

СКЛЯПЕ́ННЕ ў геалогіі, буйная дадатная платформавая структура, акруглай або авальнай формы, з адной ці некалькімі вяршынямі. Звычайна найб. выражана на паверхні крышт. фундамента. Пл. 10—100 тыс. км^2, выш. падняцця больш за 100 м, радзей да 1 км. Вуглы падзення слаёў на крылах да 1°. Акруглыя С. наз. купаламі. Некат. С. абмежаваны буйнымі тэктанічнымі разломамі. Часта складаюць *антэклізы* (напр., Татарскае, Башкірскае, Токмаўскае С. Волга-Уральскай антэклізы), радзей трапляюцца ў *сінеклізах* або прадстаўляюць ізаляваныя формы. Развіваюцца 10—100 млн. г., маюць маламагутны асадкавы чахол з перарывамі ў асадканамнажэнні. Форму С. маюць і лінейныя падняцці ў абласцях найноўшага гораўтварэння. С. — таксама найб. высокая ч. антыкліналь складкі (гл. *Антыкліналь*). *І.В.Клімовіч.*

СКЛЯ́РАЎ Валерый Анатолевіч (н. 7.3.1950, г. Новасібірск, Расія), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі і інфарматыкі. Д-р тэхн. н. (1986), праф. (1989). Скончыў Ульянаўскі політэхн. ін-т (1972). З 1972 у НДІ сродкаў аўтаматызацыі. У 1979—95 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі (з 1987 заг. кафедры). З 1995 за мяжой. Навук. працы па лагічным сінтэзе і аптымізацыі лічбавых устройстваў і сістэм. Распрацаваў графічную мову апісання, мадэлі і метады лагічнага праектавання рэканфігуравальных лічбавых устройстваў і сістэм.

Тв.: Язык С$^{++}$ и объектно-ориентированное программирование: Справ. пособие. Мн., 1997.

Г.М.Склязнёў.

Э.М.Скобелеў.

СКЛЯРЭ́НКА Сямён Дзмітрыевіч (26.9.1901, с. Прохараўка Драбаўскага р-на Чаркаскай вобл., Украіна — 8.3.1962), украінскі пісьменнік. Скончыў Залатаношскую гімназію (1919). Друкаваўся з 1918. Аўтар зб. апавяд. «Вецер з гор» (1930), аповесцей «Ціхая прыстань» (1929), «Матрос Ісай» (1930), раманаў «Бурун» (1932), «Пралог» (1936), «Радасць чалавечага існавання» (1937) і інш. Трылогія «Шлях на Кіеў» (ч. 1—3, 1937—40) пра грамадз. вайну на Украіне. У раманах «Гаспадары» (1948), «Карпаты» (1952—54) праблемы вёскі, тэма далучэння Закарпацця да Украіны. Гіст. раманы «Святаслаў» (1959), «Уладзімір» (1962) прысвечаны Кіеўскай дзяржаве 10 ст.

Тв.: Твори. Т. 1—3. Київ, 1981; Рус. пер. — Карпаты. Т. 1—2. М., 1960; Путь на Киев. М., 1970; Владимир. Мн., 1990; Святослав. Мн., 1990.

Літ.: Грицай М.С. Семен Скляренко. Київ, 1980.

СКО́БЕЛЕЎ Міхаіл Дзмітрыевіч (29.9.1843, С.-Пецярбург — 7.7.1882), расійскі ваенны дзеяч. Ген. ад інфантэрыі (1881). Скончыў Акадэмію Генштаба (1868). У арміі з 1861. У 1864 у складзе Гродзенскага гусарскага палка ўдзельнічаў у падаўленні *паўстання 1863—64*, у 1873 у паходзе на Хіву, у 1876 у падаўленні *Какандскага паўстання 1873—76*. З лют. 1876 ваен. губернатар і камандуючы войскамі Ферганскай вобл. Вызначыўся ў руска-турэцкай вайне 1877—78 (гл. *Руска-турэцкія войны 17—19 ст.*); камандаваў казацкай брыгадай і атрадамі, якія штурмавалі Плеўну (ліп.—жн. 1877), удзельнічаў у аблозе Плеўны, зрабіў зімовы пераход праз Балканы (Імітлійскі перавал), адыграў вырашальную ролю ў баі пры Шыпцы-Шэйнава і наступленні на

Цыліндрычнае **скляпенне** з распалубкамі ў касцёле езуітаў у г. Нясвіж Мінскай вобл.

Стамбул. У 1878—80 і 1881—82 камандаваў 4-м корпусам, раскватараваным на Беларусі (штаб у Мінску). У 1880—81 узначальваў 2-ю Ахалтэкінскую экспедыцыю, у час якой заваявана Туркменія. У 1882, знаходзячыся ў Парыжы, выступіў у абарону балканскіх народаў супраць палітыкі Германіі і Аўстра-Венгрыі, што выклікала міжнар. ўскладненні; адкліканы імператарам Аляксандрам III і неўзабаве памёр. Аўтар артыкулаў па ваен. справе.

Літ.: Белый генерал. М., 1992; Михаил Скобелев: [Сб.] М., 1997. *А.М.Лукашэвіч.*

СКО́БЕЛЕЎ Эдуард Марцінавіч (н. 8.12.1935, Мінск), бел. пісьменнік. Засл. дз. культуры Беларусі (1996). Скончыў Маскоўскі ін-т міжнар. адносін (1959). З 1959 у пасольстве СССР у Швейцарыі, з 1961 у Мін-ве замежных спраў Беларусі, з 1966 у апараце ЦК КПБ. З 1991 нам. дырэктара міжнар. цэнтра Акадэміі кіравання пры СМ Рэспублікі Беларусь, з 1994 у Бел. ін-це інфармацыі і прагнозу пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з 1996 гал. рэдактар «Информационного бюллетеня Администрации Президента Республики Беларусь». Друкуецца з 1964. Піша на рус. мове. Вершы з паэт. зб-каў «Дарога» (1969), «Кроплі дажджу» (1973), «Вячэрнія цені» (1977), «Мой дом» (1988), «Славянские сутры» (1996) і інш. вызначаюцца афарыстычнасцю і філасафічнасцю. У празаічных творах звяртаецца да гіст. (раманы «Міраслаў — князь Дрыгавіцкі», 1979; «Сведка», 1987, і інш.) і сучаснай маральна-этычнай праблематыкі (раманы «Крокі за тваёй сцяной», 1971; «Катастрофа», 1984; «Уцякач», 1989). У прагнастычна-філас. рамане «Скачок д'ябла» (2001) паказана асн. праблематыка сучаснага грамадства, супрацьстаянне стваральнікаў нац. духоўнасці і яе разбуральнікаў. Аўтар вершаваных драм пра С.Буднага, Сімяона Полацкага, К.Лышчынскага, Ф.Скарыну, К.Каліноўскага, Я.Купалу, Дзмітрыя Данскога, Дж.Бруна, Сакрата і інш., публіцыстычных і літ.-крытычных артыкулаў. Піша для дзяцей: «Прыгоды Арбузіка і Бябешкі» (1983, экранізавана пад наз. «Падарожжа ў краіну пачвараў»), «Хлапчукі купілі вострау» (1989), «Уладар часу» (1992), «Чорны вядзьмар» (2000) і інш. Перакладае на рус. мову вершы бел. паэтаў. Некат. яго вершы пакладзены на музыку. Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

Тв.: Маятник надежды: Роман. Мн., 1978; Выпускники: Повесть. Мн., 1984; Фигуры: Драмы. Мн., 1986; Исцеление: Стихи. М., 1989; Гефсиманский сад: Роман. Мн., 1993; Узелки на память: Заметки о лит. мастерстве. Мн., 1997; Сыны Отечества: Ист. драмы. Мн., 1999; Венки сонетов. Мн., 2001; Государь мой, куда Вы спешите?: Афоризмы и суждения. Мн., 2001.

СКО́БЛА Міхась (Міхаіл Уладзіміравіч; н. 23.11.1966, в. Паляжын Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. паэт. Скончыў БДУ (1991). З 1991 нам. гал. рэдактара час. «Роднае слова», з 1995 у Мін-ве культуры і друку, з 1997 у час. «Бярозка», з 1999 у выд-ве «Беларускі кнігазбор». Друкуецца з 1984. У кн. паэзіі «Вечны Зніч» (1990), «Вочы Савы» (1994) імкненне паяднаць мінулае і сучаснае, трывожныя матывы за лёс бацькоўскай зямлі. У зб. «Нашэсце Поўні» (2001) метафарычнае асэнсаванне рэчаіснасці. У кн. «Дзярэчынскі дыярыюш» (1999) гіст. нарыс пра в. Дзярэчын, артыкулы і эсэ пра бел. пісьменнікаў. Аўтар зб. літ. пародый «Розгі ў розніцу» (1993), кн. для дзяцей «Камень-перунок» (1998) і інш.

СКО́БЛІКАВА Лідзія Паўлаўна (н. 8.3.1939, г. Златауст Чэлябінскай вобл., Расія), расійская спартсменка (канькабежны спорт). Засл. майстар спорту (1960). Скончыла Чэлябінскі пед. ін-т (1965). Чэмпіёнка VIII і IX зімовых Алімп. гульняў (1960, г. Скво-Вэлі, ЗША — на дыстанцыях 1500 і 3000 м; 1964, г. Інсбрук, Аўстрыя — на дыстанцыях 500, 1000, 1500 і 3000 м). Абс. чэмпіёнка свету (1963, Японія; 1964, Швецыя), 25-разовая чэмпіёнка свету (1960—69), 15-разовая — СССР (1960, 1962, 1968, 1969), шматразовая рэкардсменка свету (1960, 1963, 1967, 1968) на асобных дыстанцыях.

СКО́БЛЯ, прылада для здзірання кары з бярвення і грубага іх стругання. Вядома з эпохі полеаліту. У каменным і бронзавым вяках — крамянёвая пласцінка з выгнутым дугападобным рабочым краем. У жал. веку выраблялася з жалеза. Двухручныя жал. С. класічнай формы (пласціна-дуга з вострым краем і тронкамі для драўляных ручак на канцах) шырока выкарыстоўваліся ў 10—13 ст. Іх канструкцыя заставалася практычна нязменнай на працягу ўсяго сярэдневякоўя і дажыла да нашых дзён. На Беларусі стараж. С. вядомы па археал. і этнагр. матэрыялах, знойдзеных у Верхнядзвінску, Віцебску, Гродне, Чачэрску і інш.

СКО́БРАЕ, возера ў Полацкім р-не, у бас. р. Палата, за 20 км на ПнУ ад г. Полацк. Пл. 0,54 км^2, даўж. 1,7 км, найб. шыр. 450 м, найб. глыб. 4,3 м, даўж. берагавой лініі 4,3 км. Пл. вадазбору 5,4 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу. Схілы выш. 2—5 м, разараныя, на Пн выш. 6—10 м, у ніжняй ч. стромкія, пад хмызняком. Пойма шыр. да 8 м, увільготнена, пад хмызняком. Берагі нізкія, пясчаныя, месцамі забалочаныя. Дно плоскае, у паўн.-ўсх. ч. пясчаная мель, прыбярэжная ч. да глыб. 2 м выслана пяском і апясчаненым ілам, глыбей сапрапелістае. Зарастае. Злучана пратокай з р. Палата.

СКОГ, вёска ў Багушэўскім с/с Сенненскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса. За 38 км на У ад г. Сянно, 58 км ад Віцебска, 3 км ад чыг. ст. Багушэўская. 300 ж., 119 двароў (2001). Помнік А.К.*Гараўцу* і землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СКО́ЙБЕДА Анатоль Ціханавіч (н. 2.9.1938, в. Масты Чарнігаўскай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне машынабудавання. Д-р тэхн. н. (1980), праф. (1983). Вынаходнік СССР (1976). Скончыў БПІ (1966). З 1973 у БПА (з 1979 заг. кафедры, у 1997—2000 прарэктар). Навук. працы па аўтам. кіраванні цягава-скараснымі рэжымамі шматпрыводных мабільных машын, перадачах гнуткай сувяззю, надзейнасці машын. Аўтар падручнікаў і дапаможнікаў для ВНУ.

Тв.: Автоматизация ходовых систем колесных машин. Мн., 1979; Ременные передачи. Мн., 1995 (разам з А.М.Ніканчуком); Прикладная механика. Мн., 1997 (у сааўт.); Детали машин и основы конструирования. Мн., 2000 (разам з А.В.Кузьміным, М.М.Макейчыкам).

СКОК (Skok) Петар (1881, Юркава Сяло, Харватыя — 1956), харвацкі і югаслаўскі мовазнавец. Чл.-кар. Сербскай Акадэміі навук і мастацтваў. Д-р філал. н. (1912). Скончыў Венскі ун-т (1904). Выкладаў у школе, у Загрэбскім ун-це. Даследаванні ў галіне славянскіх і раманскіх моў, параўнальнай лінгвістыкі, балканалогіі, анамастыкі і этымалогіі, гісторыі югаславянскіх і замежных л-р. Аўтар прац «Прыход славян у Міжземнамор'е» (1934), «Нарыс французскай граматыкі» (т. 1—2, 1938—39), «Асновы раманскай лінгвістыкі» (т. 1—3, 1940), «Славянства і раманства на астравах Адрыятыкі» (т. 1—2, 1950), «Этымалагічнага слоўніка харвацкай ці сербскай мовы» (т. 1—4, 1971—74). *І.А.Чарота.*

СКО́КАЎ Павел Іванавіч (н. 16.8.1940, г. Табольск Цюменскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне інфарматыкі і камп'ютэрнай графікі. Канд. тэхн. н. (1967), праф. (1996). Скончыў БПІ (1962). З 1966 у Віцебскім тэхнал. ун-це (у 1973—81 прарэктар, з 1978 заг. кафедры). Навук. працы па стварэнні алгарытмаў і праграмна-матэм. забеспячэння для апрацоўкі інфармацыі аб прасторавых і плоскіх аб'ектах і праектавання колеравых вырашэнняў адна- і шматслойных вырабаў ткацкай вытв-сці (дэсінатарскія комплексы). Аўтар навуч. дапаможнікаў для ВНУ.

Тв.: Машинная графика. Автокад. Витебск, 1998; Сборник заданий по машинной графике. Витебск, 2000.

СКО́КАЎСКАЯ СЯДЗІ́БА, помнік палацава-паркавай архітэктуры барока ў в. Скокі Брэсцкага р-на. Створана ў 18 ст. ў маёнтку М.Нямцэвіча — бацькі пісьменніка Ю.*Нямцэвіча*. Комплекс уключае палац (1770-я г.) і парк. Палац і 2 бакавыя сіметрычна пастаўленыя флігелі (афіцына і стайня, не захаваліся) утваралі парадны двор, замкнёны паўкруглай агароджай з брамай. Перад палацам на адной восі з ім стаяла драўляная родавая капліца-пахавальня. 2-павярховы прамавугольны ў плане мураваны палац, накрыты ламаным вальмавым дахам, фланкіраваны вуглавымі алькежамі, якія завяршаліся ў мінулым барочнымі фігурнымі купаламі.

Цэнтр ч. вылучана падвойнымі пілястрамі і вынаснымі балконамі на слупах. Парк мяшанага рэгулярна-пейзажнага тыпу, высаджаны на раўнінным рэльефе. У паўн. ч. знаходзяцца партэр, 2 невял. лужкі, уязная алея, у паўд. — густая грабавая алея, абапал якой лужкі, якія чаргаваннем, памерамі і формай нагадваюць баскеты рэгулярнага тыпу. Па перыметры ідзе кальцавая алея. У парку растуць экзоты: хвоя веймутава, лістоўніца еўрап., конскі каштан звычайны, акацыя белая, біручына, лох вузкалісты і інш. *В.Р.Анціпаў, А.М.Кулагін.*



Скокаўская сядзіба. Агульны выгляд (з малюнка Н.Орды) і план палаца.

СКО́ЛІІ (Scoliidae), сямейства адзіночных вос надсям. джалячых атр. перапончатакрылых. Каля 450 відаў. Пашыраны пераважна ў тропіках і субтропіках. На Беларусі 2 віды: С. чатырохкропкавая (Scolia quadripunctata) і С. валасістая, або стэпавая (S. hirta). Актыўныя днём.

Даўж. да 6 см. Цела валасістае, афарбоўка звычайна чорная з жоўтым малюнкам. Дарослыя кормяцца на кветках. Паразіты лічынак пласцініставусых жукоў, якія з'яўляюцца кормам для лічынак С. Развіццё з поўным ператварэннем. Іл. гл. ў арт. *Восы.*

С.Л.Максімава.

СКО́НЕ (Skåne), гістарычная вобласць на крайнім Пд Швецыі. Займае аднайм. паўвостраў, уразаецца ў мора на 100 км, на З абмываецца прал. Эрэсун, на Пд і У — Балт. морам. У рэльефе пераважаюць узгорыстыя раўніны, ёсць асобныя грады з гранітаў і гнейсаў (выш. да 226 м). Клімат умераны. Большая ч. тэр. разарана, участкі шыракалістых лясоў (дуб, бук), верасоўнікі. Гарады *Мальмё*, Лунд і інш.

...СКОП (ад грэч. skopeō назіраю), другая састаўная частка складаных слоў, якая абазначае назву прыбораў ці прылад для назірання (напр., *мікраскоп, тэлескоп).*

СКО́ПАС (Skopas), старажытнагрэчаскі скульптар і архітэктар 4 ст. да н.э. Ураджэнец в-ва Парас. Творчая дзейнасць прыпадае на 380—330 да н.э. Працаваў у Атыцы, у гарадах Грэцыі і М.Азіі. Работы: храм Афіны ў Тэгеі са скульпт. кампазіцыямі на франтонах (захаваліся фрагментарна), мармуровы фрыз маўзалея ў *Галікарнасе*), у рым. копіях — статуі «Менада», «Малады Геракл», «Мелеагр», «Потас». Мастацтва С. прасякнута драм. пафасам, у вобразах раскрываюцца моцныя душэўныя пачуцці, барацьба страсцей. Творчасць С. паўплывала на скульптараў эпохі эліінізму (гл. *Эліністычнае мастацтва*).

Літ.: Чубова А.П. Скопас. Л.; М., 1959.

СКО́П'Е (Скопје, Скоплје (Skoplje), горад, сталіца Македоніі. Знаходзіцца на Пн краіны, на р. Вардар. Каля 500 тыс. ж., з прыгарадамі каля 650 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Гал. эканам. і культ. цэнтр Македоніі. У С. сканцэнтравана каля 50% прамысл. вытв-сці краіны. Прам-сць: тытунёвая, піваварная, садавіна-агароднінакансервавая, мукамольная, мясная, мылаварная, гарбарна-абутковая, тэкстыльная; новыя галіны: металургія, вытв-сць алюмініевых вырабаў, с.-г. машын, шкляная, цэм., мэблевая. Саматужнае дыванаткацтва. Македонская акадэмія навук і мастацтваў. Ун-т. У 1963 горад моцна пацярпеў ад землетрасення.

У старажытнасці каля сучаснага С. знаходзіўся гал. горад ілірыйскага племя дарданаў Скупі, заваяваны ў канцы 1 ст. да н.э. рымлянамі. З канца 3 ст. н.э. Скупі — цэнтр рым. правінцыі Дарданія. У 518 ён разбураны землетрасеннем. У 6 ст. каля руін Скупі пабудаваны С. У канцы 7 ст. заселены славянамі. У 9—10 ст. у складзе Першага Балгарскага царства, з 1282 — сербскай дзяржавы. У 13—14 ст. буйны гандл. цэнтр. Пры *Стэфане Душане* (у 1331—55) С. — сталіца сербска-грэч. царства. У 1392—1912 пад уладай туркаў. З 1913 у складзе Сербіі, з 1918 Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 — Югаславіі). У 1941—45 акупіраваны ням.-фаш. войскамі, цэнтр. антыфаш. барацьбы. У 1946—91 сталіца Сацыяліст. Рэспублікі Македонія ў складзе СФРЮ.

Горад спалучаў сучасную забудову з сярэдневяковай. Да землетрасення, у выніку якога зруйнавана да 80% будынкаў, у ім захоўваліся рэшткі цыклапічных абарончых сцен і акведук (6 ст.), мячэці (Султана Мурата, 1436; Ісхак-бега, 1438; Іса-бега, 1475; Мустафа-пашы, 1492; Ях'я-пашы, 1504), лазня (1489—97), 8-арачны каменны мост (15 ст.), заезныя дамы (15—19 ст.), крыты базар «безістэн» (1689), гадзіннікавая вежа (1566—72), царква св. Спаса (канец 17 — пач. 18 ст.) і інш. помнікі архітэктуры. Рэстаўрацыйныя і аднаўленчыя работы вядуцца пераважна на аснове праекта яп. арх. К. Тангэ і макед. архітэктараў. У цэнтры горада пабудаваны Акадэмія навук і мастацтваў, Макед. нар. т-р, гіст. архіў і інш. Каля С. — руіны ілірыйскага і рым. г. Скупі (рэшткі т-ра, тэрм, базілікі, некропаля), царква св. Панцеляймона ў Неразі (1164, фрэскі). Музеі: этнагр., археал., маст. галерэя.

СКОРАБАГА́ТАЎ Віктар Іванавіч (н. 15.11.1951, Мінск), бел. спявак (лірычны барытон), педагог, муз. дзеяч. Засл. арт. Беларусі (1982). Скончыў Бел. кансерваторыю (1977). З 1977 саліст Нац. т-ра оперы Беларусі, адначасова з 1985 выкладае ў Бел. акадэміі музыкі. У 1980—81 стажыраваўся ў т-ры «Ла Скала» (Мілан). З 1992 маст. кіраўнік створанай ім «*Беларускай капэлы*». Валодае лёгкім рухомым голасам яркага тэмбру. Адзін з буйн. камерных выканаўцаў, рэпертуар якога складаюць больш за 600 твораў айч. і сусв. класікі розных гіст. і эстэт. кірункаў. Сярод партый нац. рэпертуару: Беларэцкі («Дзікае паляванне караля Стаха» У.Солтана), Мефістофель («Фауст» А.Радзівіла, опера адноўлена ў пастаноўцы С. ў 1999), Бусыга («У пушчах Палесся» А.Багатырова). Інш. ролі: Ніклаўс («Казкі Гофмана» Ж.Афенбаха), Жэрмон («Травіята» Дж.Вердзі), Валянцін («Фауст» Ш.Гуно), Малатэста («Дон Паскуале» Г.Даніцэці), Фігара, граф Альмавіва, Папагена («Вяселле Фігара», «Чароўная флейта» В.А.Моцарта), Фігара («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Ялецкі, Анегін, Раберт («Пікавая дама», «Яўген Анегін», «Іаланта» П.Чайкоўскага), Маэстра («Маэстра капэла» Д.Чымароза). У 1988—94 ажыц-

Скоп'е. Гістарычны цэнтр.

цявіў першы ў бел. выканальніцкім мастацтве праект з 10 канцэртных праграм «Анталогія беларускай вакальнай музыкі XVI—XX ст.». Даследуе старадаўнюю бел. музыку, творчасць малавядомых бел. кампазітараў, у т.л. Я.Тарасевіча. Аўтар кніг па гісторыі бел. муз. мастацтва. Гал. рэдактар серый нотных выданняў: «Музыка старажытных сядзібаў» і «Беларускі гістарычны нотазбор» (з 1995). Маст. кіраўнік штогодняга фестывалю «Адраджэнне беларускай капэлы» (з 1991). Лаўрэат Рэсп. конкурсу вакалістаў (Мінск), Міжрэсп. конкурсу вакалістаў (Талін), Усесаюзнага конкурсу маладых выканаўцаў сав. песні (Рыга; усе 1976), Усесаюзнага конкурсу імя М.Глінкі (1979; Талін), дыпламант Міжнар. конкурсу вакалістаў (1980, Парыж). Дзярж. прэмія Беларусі 1990.

Тв.: Зайгралі спадчынныя куранты. Мн., 1998; Абышоўся без славы...: Кампазітар Ян Тарасевіч. Мн., 2001. *Н.Г.Мазурына.*

СКОРАБАГА́ТЫ Кірыла Нічыпаравіч, бел. і рускі артыст балета канца 18 — пач. 19 ст. Да 1800 прыгонны танцоўшчык *Шклоўскага тэатра Зорыча*, з 1800 характарны танцоўшчык балетнай трупы Пецярбургскага імператарскага т-ра. Пасля адпушчэння на волю, у 1820-я г., быў настаўнікам танцаў у маёнтку кн. Галіцыных. Выступаў пераважна ў дывертысментах. Выконваў цыганскі танец у «Рохусе Пумпернікеле» (паст. Ш.Дзідло, 1821), рус. танцы і танец «Палішынель» у «Аглядзе нявест», арапскае па ў «Адпачынку каравана» (1822) і інш.

СКОРАГАВО́РКА, фальклорны твор, пабудаваны на спалучэнні гукаў, якія перашкаджаюць хутка і выразна вымаўляць словы; жанр народна-паэтычнай творчасці. Пашырана ў дзіцячым фальклоры і выкарыстоўваецца для трэніроўкі дыкцыі. Напр.: «Лавіў рыбак судака, судзіў судак рыбака: лоўка, рыбак, ловіш, судаку сорам робіш», «Рапартаваў ды не дарапартаваў, стаў дарапартоўваць ды зарапартаваўся», «Пекар Пётр пёк пірог» і інш. Зб. бел. нар. С. «Мама Мышка сушыла шышкі» (1983) склаў І.У.Саламевіч.

СКО́РАПІС, тып пісьма, які развіўся ва ўсх. славян з *паўустава* ў выніку паскарэння працэсу пісання. Характарызаваўся звязаным напісаннем літар у слове, свабодным узмахам і націскам пяра. У старабел. дзелавой пісьменнасці пачаў ужывацца з канца 14 ст. Ім напісаны актавыя кнігі гарадскіх, земскіх і замкавых судоў, большая ч. дакументаў Метрыкі ВКЛ, Статуты ВКЛ 1529 і 1566. Асаблівага росквіту дасягнуў у 16—17 ст., калі шырока выкарыстоўваўся ў свецкіх («Аповесць пра Трышчана», «Аповесць пра Баву», «Гісторыя пра Атылу», 2-я пал. 16 ст.; бел. пераклады «Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі» М.Стрыйкоўскага, «Александрыі», «Троі», «Рымскага летапісца» пач. 17 ст.) і рэліг. творах. С. напісана Баркулабаўская хроніка.

На аснове С. ў канцы 16 ст. створаны спец. шрыфт, якім у друкарні Мамонічаў выдадзены «Трыбунал...» (1586), Статут ВКЛ 1588, «Унія» І.Пацея (1595) і інш. Бел. С. быў больш каліграфічны і зручны для чытання, чым рускі, і ў 17 ст. прыкметна на яго ўплываў.

В.**Скорабагатаў** у ролі Маэстра.



Да арт. **Скорапіс**. Рукапіс «Троі». 17 ст.

Літ.: Карский Е.Ф. Славянская кирилловская палеография. М., 1979; Щепкин В.Н. Русская палеография. М., 1967.

А.М.Булыка.

СКО́РАСНЫ БЕГ НА КАНЬКА́Х, від *канькабежнага спорту*. Спаборніцтвы праводзяцца на дыстанцыях 500, 1000, 1500, 5000 і 10 000 м для мужчын і 500, 1000, 1500, 3000 і 5000 м для жанчын, таксама ў мнагабор'і па замкнёнай лядовай дарожцы даўж. 400 м; у шорт-трэку на дыстанцыях 500, 1000, 1500 і 3000 м і ў эстафетным бегу — 3000 м для жанчын і 5000 м для мужчын, на дарожцы даўж. 111 м.

Узнік у Нідэрландах у пач. 13 ст. Першыя канькабежныя т-вы з'явіліся ў Нарвегіі (1864), Расіі (1877); нац. федэрацыя канькабежнага спорту — у Вялікабрытаніі (1879). Афіц. міжнар. спаборніцтвы праводзяцца з канца 19 ст. (1882, Вена; 1889, Амстэрдам, і інш.). Чэмпіянаты свету праводзяцца сярод мужчын з 1893, сярод жанчын — з 1936; па спрынтарскім мнагабор'і (дыстанцыі 500 і 1000 м) — з 1970. Чэмпіянаты Еўропы праводзяцца з 1893 сярод мужчын і з 1970 — у жанчын. У праграме зімовых Алімп. гульняў — адпаведна з 1924 і 1960. Міжнар. саюз канькабежцаў засн. ў 1892, аб'ядноўвае больш за 50 краін (1999). Найб. пашыраны ў краінах Скандынавіі, ЗША, Германіі, Нідэрландах, Расіі, Японіі і інш. Спаборніцтвы па шорт-трэку праводзяцца з 1970-х г. Чэмпіянаты свету з 1978. У праграме Алімп. гульняў — з 1992.

На Беларусі першыя секцыі ўзніклі ў 1922 (г. Полацк). У 1926 адбыўся 1-ы чэмпіянат Мінска, чэмпіянаты Беларусі праводзяцца з 1933. Першыя чэмпіёны — З.*Бальшакова* і Б.*Бальшакоў* (адпаведна 17 і 9 разоў). Сярод бел. канькабежцаў найб. вызначыліся І.*Жалязоўскі*, Э.*Матусевіч*, У.Кажаноўскі — чэмпіён СССР сярод юнакоў (1977) на дыстанцыі 500 м, А.Кацюга — бронз. прызёр чэмпіянату свету па спрынтэрскім мнагабор'і (2002, Нарвегія), 5-е месца ў спрынце на XIX зімовых Алімп. гульнях (2002 г. Солт-Лейк-Сіці, ЗША) з рэкордам Беларусі на дыстанцыі 500 м. *А.М.Петрыкаў.*

СКО́РАСЦЬ у механіцы, вектарная фіз. велічыня, якая характарызуе быстрыню перамяшчэння матэрыяльнага пункта (часціцы) уздоўж траекторыі; адна з асн. кінематычных велічынь. Пры раўнамерным руху модуль С. роўны адносінам пройдзенага шляху Δs да прамежка часу Δt: $v = \Delta s/\Delta t$.

Пры нераўнамерным руху С. часціцы ў дадзены момант часу t вызначаецца формулай $\vec{v} = \lim\limits_{\Delta t \to 0} \frac{\Delta \vec{r}}{\Delta t} = \frac{d\vec{r}}{dt}$, дзе $\Delta \vec{r}$ — перамяшчэнне часціцы за малы прамежак часу Δt, $\vec{r} = \vec{r}(x, y, z)$ — радыус-вектар і $x(t)$, $y(t)$, $z(t)$ — каардынаты часціцы ў момант часу t. Вектар накіраваны па датычнай уздоўж траекторыі руху часціцы, а яго модуль $v = \sqrt{v_x^2 + v_y^2 + v_z^2}$, дзе $v_x = \frac{dx}{dt}$, $v_y = \frac{dy}{dt}$, $v_z = \frac{dz}{dt}$ — праекцыі $\vec{v}$ на адпаведныя восі каардынат. За канечны прамежак часу Δt адрозніваюць сярэднюю С. пе-

рамяшчэння $\langle \vec{v} \rangle = \frac{\Delta \vec{r}}{\Delta t}$ і сярэднюю С. прахо-джання шляху $\langle v \rangle = \frac{\Delta s}{\Delta t}$ дзе $\Delta \vec{r}$ — вектар перамяшчэння і Δs — шлях, пройдзены ўздоўж траекторыі за Δt. Адзінка С. ў СІ — метр за секунду. *А.І.Болсун.*



Графічнае вызначэнне скорасці ў механіцы: *ab* — траекторыя руху часціцы; $\vec{r}$ — радыус-вектар пачатковага становішча (1) часціцы ў момант часу t; $\Delta \vec{r}$ — перамяшчэнне часціцы за прамежак часу Δt; ΔS — шлях часціцы на адрэзку траекторыі 1—2.

СКО́РАСЦЬ АСЯДА́ННЯ ЭРЫТРАЦЫ́ТАЎ, тое, што *рэакцыя асядання эрытрацытаў.*

СКО́РАСЦЬ ГУ́КУ, скорасць распаўсюджвання *гуку* ў матэрыяльным асяроддзі. Вызначаецца пругкасцю і шчыльнасцю асяроддзя. Скорасць гарманічнай гукавой хвалі (гл. *Гарманічныя ваганні*) наз. *фазавай скорасцю* гуку. Звычайна С.г. — велічыня пастаянная для дадзенага рэчыва пры дадзеных знешніх умовах і не залежыць ад частаты хвалі і яе амплітуды. У выпадку залежнасці фазавай скорасці ад частаты гуку мае месца *дысперсія хваль* і тады карыстаюцца паняццем *групавой скорасці.*

С.г. ў газах меншая, чым у вадкасцях, у вадкасцях меншая, чым у цвёрдых целах (прычым для зрухавых хваль яна меншая, чым для падоўжных). С.г. ў газах і парах 150—1000 м/с, у вадкасцях 750—2000 м/с, у цвёрдых целах 2000—6000 м/с, у паветры пры нармальных умовах 330 м/с, у вадзе прыкладна 1500 м/с. У монакрышт. цвёрдых целах С.г. залежыць ад напрамку распаўсюджвання хвалі адносна крышталеграфічных восей. Вымярэнне С.г. выкарыстоўваецца для вызначэння многіх характарыстык рэчыва, напр., сціскальнасці газаў і вадкасцей, модуляў пругкасці цвёрдых цел, зоннай структуры паўправаднікоў і інш. *Л.М.Шахлевіч.*

СКО́РАСЦЬ РЭА́КЦЫІ ў хіміі, колькасная характарыстыка інтэнсіўнасці *рэакцыі хімічнай*; асн. паняцце *кінетыкі хімічнай.* Вызначаецца змяненнем колькасці часціц (малекул, іонаў) кожнага рэчыва, што прымае ўдзел у хім. рэакцыі, за адзінку часу ў адзінцы аб'ёму (канцэнтрацыі рэчыва для гамагенных рэакцый) ці на адзінку плошчы паверхні падзелу фаз (для гетэрагенных і тапахім. рэакцый). Гл. таксама *Парадак рэакцыі.*

СКО́РАСЦЬ СВЯТЛА́ ў вакууме, скорасць распаўсюджвання эл.-магн., у т.л. светлавых, хваль у свабоднай прасторы (вакууме); адна з *фундаментальных фізічных пастаянных.* Максімальна магчымая (лімітная) скорасць распаўсюджвання любых фіз. узаемадзеянняў і інварыянтная пры пераходзе ад адной інерцыяльнай сістэмы адліку да іншай (гл. *Адноснасці тэорыя*). Роўная: c = = 299 792 458 м/с (дакладна).

С.с. ў матэрыяльным асяроддзі залежыць ад паказчыка пераламлення, рознага для розных частот (даўжынь хваль) выпрамянення (гл. *Дысперсія хваль*). С.с. вызначыў у 1676 О.К.*Ромер* па зменах прамежкаў часу паміж зацьменнямі спадарожнікаў Юпітэра. Даследы А.І.*Фізо*, Ж.Б.Л.*Фуко*, А.А.*Майкельсана* і інш. па вымярэнні С.с. адыгралі вызначальную ролю ў станаўленні электрадынамікі і выяўленні эл.-магн. (хвалевай) прыроды святла. С.с. ўваходзіць у асн. ўраўненні і суадносіны электрадынамікі, оптыкі і рэлятывісцкай механікі, а яе дакладнае значэнне выкарыстоўваецца для вымярэння адлегласцей у радыё- і аптычнай лакацыі, сістэмах сачэння ШСЗ і інш.

Літ.: Вафиади В.Г., Попов Ю.В. Скорость света и ее значение в науке и технике. Мн., 1970. *А.І.Болсун.*

СКО́РБУТ, хвароба ад недастатковага паступлення з ежай вітаміну С, тое, што *цынга.*

СКО́РЫКАЎ Мікалай Мікалаевіч (н. 19.11.1957, г. Гомель), бел. эстрадны спявак. Засл. арт. Беларусі (1992). Скончыў Гомельскае муз. вучылішча (1978), Бел. кансерваторыю (1983, кл. С.Асколкава). З 1985 саліст Дзярж. акад. нар. хору Беларусі імя Г.Цітовіча, з 1988 саліст-вакаліст Дзярж. аркестра сімф. і эстр. музыкі Беларусі. Валодае моцным прыгожым голасам, тэмбр якога пашыраецца ад мяккага лірычнага барытона да аксамітнага драм. баса. Яго выкананню характэрны тэмперамент, драм. майстэрства, глыбокае пранікненне ў муз. вобраз. У канцэртным рэпертуары значнае месца займаюць песні бел. кампазітараў, у т.л. І.Лучанка, Э.Зарыцкага, Л.Захлеўнага, У.Будніка. Лаўрэат І-га Усесаюзнага радыёконкурсу «Новыя імёны» (1987), Гран-пры Міжнар. конкурсу «Музыка свету» (1998, Італія). *В.З.Анісовіч.*

СКОТ (Scott), новазеландская навуковая палярная станцыя ў Зах. Антарктыдзе на п-ве Роса, каля базы ЗША Мак-Мерда. Адкрыта ў студз. 1957. Назіранні па аэраметэаралогіі, гляцыялогіі, акіяналогіі, біялогіі; служыць базай для маршрутных даследаванняў. Названа імем англ. даследчыка Антарктыды Р.Ф.*Скота.*

СКОТ (Scott) Вальтэр (15.8.1771, г. Эдынбург, Вялікабрытанія — 21.9.1832), англійскі пісьменнік. Вучыўся ў Эдынбургскім ун-це. Па адукацыі юрыст. З 1799 шэрыф, з 1806 сакратар суда. Літ. дзейнасць пачаў са збірання нар. легенд і балад (зб. «Песні шатландскай мяжы», ч. 1—3, 1802—03). Папулярнасць набыў рамант. паэмамі «Песня апошняга менестрэля» (1805), «Марміён» (1808), «Дзева возера» (1810) і інш., у якіх спалучэнне драм. фабулы з маляўнічымі шатл. пейзажамі, сцэнамі палявання і казачнымі прыгодамі. Сусв. вядомасць С. прынеслі гіст. раманы, у якіх ён стварыў партрэты Шатландыі, Англіі і кантынента з пач. сярэдневякоўя і да канца 18 ст., паказаў уплыў паліт. і інш. сіл на развіццё чалавечай асобы. Аўтар т.зв. шатландскіх раманаў, у т.л. «Уэверлі» (1814), «Пурытане» (1816), «Роб Рой» (1818), у якіх адлюстраваў найб. значныя падзеі з гісторыі Шатландыі. У рамане «Айвенга» (т. 1—3, 1820, экранізаваны ў 1952 і 1983) на фоне жорсткага самавольства феадалаў, гвалтоўных дзеянняў рыцараў-крыжакоў паказаў рамант. каханне і адвагу, пышнасць рыцарскіх турніраў. Раманы «Манастыр», «Абат» (абодва 1820), «Кенілварт» (1821), «Вудстак» (1826) і інш. пра падзеі з гісторыі Англіі, раман «Квенцін Дорвард» (т. 1—3, 1823, экранізаваны ў 1988) пра абс. манархію ў Францыі ў часы праўлення Людовіка XI. Сярод найб. вядомых раманаў: «Чорны карлік» (1816), «Ламемурская нявеста» (1819), «Перцкая прыгажуня» (1828), «Граф Роберт Парыжскі» (1832, экранізаваны ў 2000 пад назвай «Рыцарскі раман») і інш. Аўтар гіст. і гісторыка-літ. прац, аповесцей, навел. Творчасць С., якая вызначаецца гістарызмам, асабістым поглядам на падзеі, рамант. героямі і рэаліст. паказам жыцця, паўплывала на развіццё гіст. рамана ў сусв. л-ры 19—20 ст. На бел. мову яго асобныя раманы пераклалі Л.Забалоцкая, М.Пазнякоў.

Тв.: Бел. пер. — Айвенга. Мн., 1997; Квенцін Дорвард. Мн., 1997; Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—20. М.; Л., 1960—65.

Літ.: Орлов С.А. Исторический роман Вальтера Скотта. Горький, 1960; Реизов Б.Г. Творчество Вальтера Скотта. М.; Л., 1965; Пирсон Х. Вальтер Скотт. 2 изд. М., 1983; Вальтер Скотт: Биобиблиогр. указ. М., 1958. *М.С.Рагачэўская.*

В.Скот.


Е.К.Скоу.

СКОТ (Scott) Джайлс Гілберт Малодшы (9.11.1880, Лондан — 8.11.1960), англійскі архітэктар; гал. прадстаўнік неагатычнага кірунку ў англ. архітэктуры 20 ст. Унук Дж.Г.*Скота.* Вучыўся ў каледжы Боманта ў г. Віндзар. Прэзідэнт Арх. асацыяцыі (1920—21) і Каралеўскага ін-та брыт. архітэктараў (1933—35). Асн. творы: англіканскі сабор (1904—24) у Ліверпулі,

электрастанцыя Батэрсі (1932—34) і мост Ватэрлоо (1939—45) у Лондане, б-ка ун-та (адкрыта ў 1934) у Кембрыджы, будынкі б-кі Бодлі (1946) у Оксфардзе.

СКОТ (Scott) Дэйвід (н. 6.6.1932, г. Сан-Антоніо, штат Тэхас, ЗША), касманаўт ЗША. Палкоўнік ВПС (з 1977 у адстаўцы). Скончыў Ваен. акадэмію ЗША (1955), Масачусецкі тэхнал. ін-т (1962). З 1963 у групе касманаўтаў НАСА. 16.3.1966 з Н.*Армстрангам* здзейсніў (як 2-і пілот) палёт на касм. караблі (КК) «Джэміні-8», 3—13.3.1969 з Дж.Макдывітам і Р.Швейкартам — палёт на КК «Апалон-9» (як пілот асн. блока), 26.7—7.8.1971 з Дж.Ірвінам і А.Уордэнам — палёт на Месяц (як камандзір) на КК «Апалон-15». Правёў у космасе 22,8 сут, у т.л. на Месяцы 18,6 гадз. Залаты медаль НАСА «За выключныя заслугі», залаты медаль Міру (ААН). *У.С.Ларыёнаў.*

СКОТ (Scott) Джордж Гілберт (1811, Гокат, каля г. Бакінгем, Вялікабрытанія, — 27.3.1878), англійскі архітэктар. З 1868 праф. Лонданскай АМ. У 1873—76 прэзідэнт Каралеўскага ін-та брыт. архітэктараў. Пад уплывам арх. Ш.А.П'юджына-бацькі стаў прыхільнікам кірунку несапраўднай готыкі. Будаўнік і рэстаўратар шматлікіх сабораў, цэркваў, манастыроў і інш. Найб. значныя работы: капэла (1864—69) і б-ка 1642 (рэстаўрацыя) Сент-Джонс-каледжа ў Кембрыджы, ун-т (1864—70, эклектыка) у Глазга, вакзал Сент-Панкрас (1868—74, У.Барла) у Лондане, ратуша (1873) ва Уінчэстэры, сабор Сент-Мэры (1874—79) у Эдынбургу; Мікалайкірхе (1846—63) у Гамбургу (Германія).

СКОТ (Scott) Роберт Фолкан (6.6.1868, г. Плімут, Вялікабрытанія — 27.3.1912), англійскі палярны даследчык. У 1901—04 кіраваў экспедыцыяй у Антарктыду, якая адкрыла п-аў Эдуарда VII, даследавала ўнутр. ч. Зямлі Вікторыі, ледавік Роса, дайшла да 82°17′ паўд. ш. У 1910 узначаліў 2-ю экспедыцыю, якая ў пач. 1911 на судне «Тэра-Нова» прыбыла ў Антарктыду і засталася на зімоўку. У ліст. 1911 С. з 4 спадарожнікамі накіраваўся да Паўд. полюса, які дасягнуў 18.1.1912 (на 33 дні пазней за нарв. даследчыка Р.*Амундсена*). Загінуў на зваротным шляху. Яго імем названы горы на Зямлі Эндэрбі, 2 ледавікі ў Антарктыдзе, востраў каля яе берагоў, палярныя станцыі амер. (Амундсен—Скот) і новазел. (*Скот*), ін-т палярных даследаванняў у Кембрыджы. *М.К.Багадзяж.*

СКО́ТА (Skotto), з П а р м ы італьянскі архітэктар 2-й пал. 16 ст. Паводле яго праекта ў 1580 перабудаваны палац *Гродзенскага Старога замка* (ад ранейшага гатычнага замка 1398 засталіся толькі сцены і некалькі вежаў).

СКО́ТНІКАЎ Валерый Аляксандравіч (14.2.1929, г. Цвер, Расія — 27.5.1988), бел. вучоны ў галіне машынабудавання. Д-р тэхн. н. (1976), праф. (1977). Засл. дз. нав. Беларусі (1985). Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т (1952). З 1966 у Бел. ін-це механізацыі сельскай гаспадаркі (з 1977 рэктар). Навук. працы па тэорыі і праектаванні дарожных, меліярацыйных і с.-г. машын і трактароў. Распрацаваў асновы тэорыі колавых і гусенічных машын.

Тв.: Проходимость машин. Мн., 1982 (разам з А.В.Панамаровым, А.У.Кліманавым); Основы теории и расчета трактора и автомобиля. М., 1986 (разам з А.А.Машчэнскім, А.С.Салонскім); Мелиоративные, строительные и лесные тракторы. Мн., 1989 (у саўт.).

Л.В.Бароўка.

СКОТЧ (англ. scotch надрэз), клейкая стужка для ўпакоўкі ў выглядзе невял. рулона, ад якога адразаецца неабходная частка.

СКО́ТЫ (позналац. Scotti, Scoti), група кельцкіх плямён. Упершыню згадваюцца ў познарым. пісьменнікаў у сувязі з нападамі С. і *піктаў* на рым. правінцыю Брытанія. Першапачаткова жылі ў Ірландыі (адсюль адна з назваў Ірландыі ў рым. крыніцах — Скотыя). Пазней, магчыма ў сярэдзіне 1-га тыс. н.э., частка С. перасялілася на Пн Брытаніі, дзе падпарадкавала піктаў і ў сярэдзіне 9 ст. заснавала каралеўства, якое атрымала назву *Шатландыя* (Scotland, літар. краіна С.).

СКО́У (Skou) Енс Крысціян (н. 8.10.1918, г. Лемвіг, Данія), дацкі біяхімік і фізіёлаг. Чл. Каралеўскай Дацкай акадэміі навук і літаратуры (1965), Нам. акадэміі прыродазнаўцаў «Леапальдзіна» (1977). Замежны чл. Нац. АН ЗША (1988). Д-р медыцыны (1954). Скончыў Капенгагенскі ун-т (1944). З 1947 у Орхускім ун-це (з 1963 праф. і кіраўнік Ін-та фізіялогіі, у 1978—88 кіраўнік Ін-та біяфізікі). Навук. працы па вывучэнні мясц. анестэтыкаў, біяэнергетыцы жывой клеткі, мембраннай біяхіміі і фізіялогіі. Адкрыў (1957) іоннатранспартны фермент натрыйкаліевую адэназінтрыфасфатазу, які ажыццяўляе адзін з фундаментальных працэсаў у жывой клетцы — перанос іонаў Na^+ і K^+ праз клетачную мембрану. Заклаў асновы мембраннай біяхіміі трансп. пратэінаў. Нобелеўская прэмія 1997 (разам з П.Д.Боерам, Дж.Э.*Уокерам*).

М.М.Касцюковіч.

СКО́ФІЛД (Scofield) Пол (н. 21.1.1922, г. Херстпірпойнт, Вялікабрытанія), англійскі акцёр. Вучыўся ў школах пры Рэпертуарным т-ры (1939, г. Кройдан) і пры т-ры «Маск» (1940—41, Лондан). З 1942 выступаў у Вандроўным, з 1944 у Бірмінгемскім, з 1946 у Шэкспіраўскім мемарыяльным (г. Стратфард-он-Эйван), з 1949 у інш. т-рах. Лепшая яго роля — Гамлет («Гамлет» У.Шэкспіра). Сярод інш. роляў: Лір, Макбет (аднайм. трагедыі Шэкспіра), Томас Мор («Чалавек на ўсе часы» Р.Болта; прыз 4-га Міжнар. кінафестывалю ў Маскве за лепшую мужчынскую ролю ў аднайм. фільме, 1966), Траплёў, Вайніцкі («Чайка», «Дзядзька Ваня» А.Чэхава), Хлестакоў («Рэвізор» М.Гогаля). З 1954 здымаецца ў кіно. Сярод фільмаў: «Скарпіён», «Ганна Карэніна», «Гамлет» і інш. Гастраліраваў у СССР у 1955, 1964, 1968.

Літ.: К о в а л е в Ю.В. Пол Скофилд. Л., 1970.

СКО́ЧКІ (Sempervivum), род кветкавых раслін сям. таўсцянкавых. Каля 30 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн.-Зах. Афрыцы. На Беларусі 1 від — С. ажылкавыя (S. sobolifera), які часта выдзяляюць у род Jovibarba. Трапляюцца па сухіх пясчаных месцах у хваёвых лясах. Як дэкар. расліны вырошчваюць С. дахавыя (S. tectorum) і каўказскія (S. caucasicum).

Шматгадовыя травы выш. да 40 см. Лісце мясістае, чаргаванае, ніжняе — у шчыльнай разетцы. Неквітучыя атожылкі ў выглядзе шарападобных разетак. Кветкі двухполыя, белыя, жоўтыя, ружовыя, чырв. ці пурпурныя ў шчыткападобна-мяцёлчатых суквецьях. Плод — лістоўка. Пасля плоданашэння расліна адмірае. Лісце і маладыя парасткі спажываюць як салату. Дэкар., лек., харч., меданосныя расліны. *А.М.Скуратовіч.*

1

2

Скочкі: 1 — закаўказскія; 2 — каўказскія.

СКРАБЕ́ЦКІ Леан, піяніст, педагог, дырыжор, кампазітар 19 ст. Творчае жыццё звязана з Беларуссю і Расіяй. З сярэдзіны 1850-х г. у Магілёве, выступаў у канцэртах як выканаўца на фп. і

фісгармоніі, дырыжыраваў аркестрам мясц. аматараў, навучаў ігры на розных інструментах. З канца 1868 у Віцебску, з 1869 у Мінску, дзе дырыжыраваў *Мінскім гарадскім аркестрам*. У 1876—80 адзін з дырыжораў муз. т-ва ў г. Растоўна-Доне. Аўтар шэрагу фп. і вак. твораў, якія друкаваліся ў Вільні і Варшаве; артыкулаў пра муз. жыццё Магілёва ў польскім муз. часопісе «Ruch Muzyczny» («Музычны рух»). Супрацоўнічаў з рэдакцыямі газет «Могилевские губернские ведомости» і «Донская пчела».

А.Л.Капілаў.

СКРА́БІН Аляксандр Мікалаевіч (6.1.1872, Масква — 27.4.1915), рускі кампазітар і піяніст, педагог. Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1892, кл. С.Танеева, В.Сафонава). З 1895 вёў канцэртную дзейнасць. У 1898—1903 праф. Маскоўскай кансерваторыі. У 1904—10 жыў і працаваў за мяжой (з перапынкамі). У яго творчасці ўвасоблены ідэі экстатычнага памкнення да невядомых «касмічных» сфер, стваральнай сілы мастацтва. Музыцы ўласцівы напружанасць, дыяпазон вобразаў ад натхнёна-ідэальных, вытанчаных да экспрэсіўна-гераічных. Наватар муз.-выразных сродкаў; развіваў ідэю спалучэння каляровага святла і музыкі, упершыню ў муз. практыцы ўвёў партыю каляровага святла (сімф. паэма «Праметэй»). Станаўленне стылю С. выявілася ў сімфанізме. Аўтар твораў: для арк. — 3 сімфоній (1900—04, 3-я — «Боская паэма»), сімф. паэм «Мары» (1898), «Паэма экстазу» (1907), «Праметэй» («Паэма агню», з фп. і хорам, 1910); канцэрта для фп. з арк. (1897); для фп. — 10 санат (1892—1913), 29 паэм, 26 эцюдаў, 90 прэлюдый, 21 мазуркі, 11 экспромтаў, вальсаў, фантазій і інш. Творчасць С. паўплывала на фп. і сімф. музыку 20 ст.

Літ. та.: Письма. М., 1965.

Літ.: Дельсон В.Ю. Скрябин. М., 1971; Бэлза И. А.Н.Скрябин. М., 1987; Рубцова В. А.Н.Скрябин. М., 1989.

Т.А.Дубкова.

СКРА́БІН Георгій Канстанцінавіч (17.9.1917, С.-Пецярбург — 26.3.1998), расійскі мікрабіёлаг і біяхімік. Акад. АН СССР (1979, чл.-кар. 1968). Сын К.І.*Скрабіна*. Скончыў Казанскі вет. ін-т (1942). З 1949 у Ін-це мікрабіялогіі АН СССР. З 1967 дырэктар Ін-та біяхіміі і фізіялогіі мікраарганізмаў АН СССР. У 1967—74 дырэктар Навук. цэнтра біял. даследаванняў АН СССР у г. Пушчына. У 1971—88 гал. вучоны сакратар прэзідыума АН СССР. Навук. працы ў галіне агульнай і тэхн. мікрабіялогіі і біяхіміі мікраарганізмаў. Дзярж. прэмія СССР 1971. Залаты медаль імя І.І.Мечнікава 1984.

СКРА́БІН Канстанцін Іванавіч (7.12.1878, С.-Пецярбург — 17.10.1972), расійскі вучоны ў галіне гельмінталогіі; заснавальнік сав. школы гельмінталогаў. Акад. АН СССР (1939), УАСГНІЛ (1935), АМН СССР (1944). Правадз. і ганаровы чл. іншаземных акадэмій (Францыі, Балгарыі, Венгрыі, Польшчы і інш.), навук т-ваў ЗША, Вялікабрытаніі, Бельгіі, Індыі і інш. Д-р вет., мед., біял. н. (1934, 1938, 1943). Герой Сац. Працы (1958). Скончыў Юр'еўскі вет. ін-т (1905). У 1917—43 праф. Данскога, Маскоўскага, Ленінградскага, Казанскага вет. ін-таў; адначасова з 1920 ва Усесаюзным ін-це гельмінталогіі (у 1931—61 дырэктар). З 1956 віцэ-прэзідэнт УАСГНІЛ. Навук. працы па марфалогіі, сістэматыцы, экалогіі паразітычных чарвей с.-г. жывёл і чалавека, эпідэміялогіі і мерапрыемствах па барацьбе з гельмінтозамі (распрацаваў прынцыпы дэгельмінтызацыі і дэвастацыі). Апісаў каля 200 новых відаў і даў абгрунтаванне 120 новым родам гельмінтаў. Увёў паняцце аб дадатковых і рэзервуарных гаспадарах, транзітным паразітызме і сімбіяпаразітызме, бія- і геагельмінтозах. Ленінская прэмія 1957. Дзярж. прэмія СССР 1941, 1950.

А.М.**Скрабін.**

К.І.**Скрабін.**

Тв.: Гельминтозы человека. Ч. 1—2. М.; Л., 1929—31 (разам з Р.С.Шульцам); Основы общей гельминтологии. М., 1940; Трематоды животных и человека: Основы трематодологии. Ч. 1—23. М.; Л., 1947—70; Моя жизнь в науке. М., 1969.

Літ.: Гильденблат А.А., Заянчковский И.Ф. Академик К.И. Скрябин и советская гельминтология. М., 1963.

СКРАБО́К, шматфункцыянальная прылада працы з аббітага каменю, найчасцей з крэменю, для апрацоўкі скуры, рогу, косці і дрэва. Вядомы з эпохі палеаліту, выкарыстоўваўся і ў эпоху бронзы. С. адрозніваліся формай загатоўкі, арыентацыяй рабочага ляза (на пласціне, адшчэпе, сколе і г.д.), а таксама другаснай апрацоўкай (рэтушшу). На Беларусі найб. стараж. С. знойдзены ў *Бердыжы* і *Юравічах*.

СКРАЗНА́Я ДАЛІ́НА, даліна прарыву, вузкія і глыбокія ўчасткі рачных далін, якія праразаюць горныя хрыбты (на ўсю шырыню) або ўзвышшы. Узнікаюць пры гораўтварэнні або падняцці ўчастка зямной паверхні, у які рака ўразаецца ў выніку рэгрэсіўнай эрозіі, а таксама ў выніку прарыву вады з прыледавіковых азёр праз найб. нізкае месца ўзвышша.

СКРАЗНА́Я РЫ́ФМА, *рыфма*, якая праходзіць праз увесь вершаваны твор. Побач з радкамі са С.р. могуць быць радкі без яе ці спалучаныя інш. рыфмоўкай. Для С.р. характэрна сіметрычнасць размяшчэння спалучаных ёю вершаваных радкоў. С.р. выдзяляе найбольш значныя ў маст. адносінах словы:

Як на свет радзіўся Янка,
Як заплакаў многа-мала, —
Пела маці над калыскай,
А зязюлька кукавала:

Ку-ку, ку-ку, кінь дакуку!
Спі, саколік! Ку-ку, ку-ку!

Як падрос, падняўся Янка,
Як ганяць стаў ў поле стала, —
На жалейцы граў дзень цэлы,
А зязюлька кукавала:

Ку-ку, ку-ку, кінь дакуку!
Пасі статак! Ку-ку, ку-ку!
(Я.Купала. «А зязюлька кукавала...»)

А.А.Майсейчык.

СКРАМАСА́КС (ням. Skramasax), адзін з відаў колюча-сякучай *халоднай зброі* бліжняга бою. Нож з прамым адналязовым клінком (даўж. 20—50 см, шыр. 2—4 см) з патоўшчанай спінкай і дзяржаннем. Вядомы з пач. н.э. У эпоху Вял. перасялення народаў С. — тыповая зброя «варвараў» Паўн.-Зах. і Сярэдняй Еўропы; напр., у франкаў — асн. від узбраення. З сярэдзіны 1-га тыс. н.э. ўвайшоў у баявы ўжытак ч. балцкага і фінскага насельніцтва ўзбярэжжа Балт. мора. Для ўзбраення славян не характэрны. У 10—11 ст. знік з вайск. ўжытку. Ва Усх. Прусіі, зах. раёнах Літвы і Латвіі выкарыстоўваўся і ў 12 ст. (магчыма, і пазней). На Беларусі С. знойдзены пры раскопках селішча Гарадок (2-я пал. 9 — пач. 10 ст.) і курганнага могільніка Вышадкі (10 ст.) Гарадоцкага р-на, у Віцебску і Мінску (12 ст.). Паводле меркавання некат. даследчыкаў, ад С. вядуць сваё паходжанне асобныя тыпы *цесакоў* і *корды*.

Літ.: Кулаков В.И. Древности пруссов, VI—XIII вв. М., 1990; Казакявичюс В.К. Оружие балтских племен II—VIII вв. на территории Литвы. Вильнюс, 1988.

Г.В.Ласкавы.

СКРА́НТАН (Scranton), горад на ПнУ ЗША, штат Пенсільванія. Засн. ў 1788. 74,7 тыс. ж., з г. Уілкс-Барэ і агульнымі прыгарадамі каля 800 тыс. ж. (1998). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: вытв-сць прамысл. абсталявання, боепрыпасаў, мед. інструментаў; радыёэлектронная, паліграф., тэкст., швейная, харчовая. 2 ун-ты.

СКРО́БАВА-ГАРАДЗІШЧАНСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1916, гл. ў арт. *Баранавіцкая аперацыя 1916*.

СКРО́НЕВЫЯ КО́ЛЬЦЫ, жаночыя ўпрыгожанні з каляровых металаў (радзей з серабра), якія насілі каля скроняў. С.к. падтрымлівалі прычоску, іх упляталіў валасы па некалькі штук з кожнага боку, мацавалі з дапамогай стужкі ці раменьчыка; магчыма, у некат. выпадках мацавалі ў мочцы вуха.

Паявіліся ў бронзавым веку. Лічыліся спецыфічным упрыгожаннем зах. славян 8—9 ст. У сярэдневякоўі былі пашыраны ў Візантыі і Зах. Еўропе. Ва ўсх. славян С.к. набылі асаблівую папулярнасць у 11—12 ст.; былі ўпрыгожаннем сялянак і гараджанак. На Беларусі самыя стараж. С.к. належалі *сярэднядняпроўскай культуры*, у жал. веку — *мілаградскай культуры, зарубінецкай культуры, штрыхаванай керамікі культуры*. С.к. класіфікуюць паводле знешняга выгляду і тэхналагічных адзнак. Вылучаюць драцяныя, пацеркавыя, шчытковыя, прамянёвыя і блізкія да іх лопасцевыя. Прынята лічыць, што С.к. нясуць этнавызначальныя функцыі, што дае магчымасць удакладніць карту расселення плямён (гл. ў арт. *Вяцічы, Дрыгавічы, Крывічы, Радзімічы*).

Літ.: Левашова В.П. Височные кольца // Очерки по истории русской деревни X—XIII вв. М., 1967.

Скроневыя кольцы з курганнага могільніка Каласы Рагачоўскага раёна Гомельскай вобл. 11—12 ст.

СКРУ́БЕР (англ. scrubber ад scrub скрэбці, чысціць), 1) апарат, у якім прамысл. газы ачышчаюцца ад цвёрдых або газападобных прымесей шляхам прамывання вадкасцю. Бываюць з фарсункамі для распылення вадкасці, з насадкамі (керамічнымі кольцамі) і з вярчальнымі лапаткамі для перамешвання газаў з вадкасцю. З дапамогай С. улоўліваюць прадукты *каксавання*, робяць ачыстку газаў ад *пылу* (пылаўлоўліванне, *газаачыстку*), выдаленне з іх попелу і інш. 2) Машына барабаннага тыпу для прамыўкі карысных выкапняў вадой з мэтай ачысткі ад гліністых і інш. дамешкаў. Бываюць праматочныя, у якіх вада і матэрыял, што прамываецца, рухаюцца ў адным напрамку, і процітачныя, дзе яны перамяшчаюцца ў сустрэчных напрамках. Гл. таксама *Абсорбер*.



Схема **скрубера**: 1 — газаход; 2 — камера змешвання; 3 — прыёмны патрубак газу; 4 — фарсунка (распыляльнік вадкасці); 5 — трубаправод вадкасці; 6 — камера ачышчанага газу; 7 — помпа.

СКРУ́ПУЛ (лац. scrupulum ад scrupulus маленькі востры каменьчык) аптэкарскі, 1) брытанская адзінка масы ў фармакалогіі. 1 С. = 20 гранам = $^1/_3$ драхмы = 1,295 98 г (гл. *Гран, Драхма, Аптэкарская вага*). 2) Рус. адзінка масы, якая выкарыстоўвалася да ўвядзення *метрычнай сістэмы мер*. 1 С. = 1,244 г.

СКРЫ́БАЎЦЫ, вёска ў Мажэйкаўскім с/с Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл.; чыг. ст. на лініі Масты—Ліда. Цэнтр эксперым. базы «Усход». За 25 км на ПнУ ад г. Шчучын, 90 км ад Гродна. 660 ж., 250 двароў (2001). Філіял Шчучынскага збожжапрыёмнага прадпрыемства. Сярэдняя школа, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СКРЫГА́ЛАЎ, вёска ў Мазырскім р-не Гомельскай вобл., на аўтадарозе Мазыр—Петрыкаў. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 33 км на З ад горада і чыг. ст. Мазыр, 166 км ад Гомеля. 808 ж., 338 двароў (2001). Участак камунальнага унітарнага прадпрыемства «Камунальнік Палесся». Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Капліца (1906), царква. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі курганныя могільнікі (10—13 ст.).

У гіст. крыніцах упершыню ўпамінаецца пад 1497 у ВКЛ у сувязі з нападам татараў і забойствам у вёсцы кіеўскага мітрапаліта Макарыя. У 16 ст. каралеўскі маёнтак, потым прыватнае ўладанне. З 1782 мястэчка ў Мазырскім пав. З 1793 у Рас. імперыі. З 1861 цэнтр воласці. У 1863 адкрыта земскае нар. вучылішча. У 1886 у С. 495 ж., 57 двароў, школа, царква, яўр. малітоўны дом, крама, у 1909 — лесапільны з-д, урачэбны пункт. З канца 1930-х г. — вёска. З 20.8.1924 да 14.10.1926 і з 3.7.1939 цэнтр сельсавета ў Мазырскім р-не, з 15.10.1926 у Слабодскім, з 4.8.1927 у Петрыкаўскім р-нах. У Вял. Айч. вайну ням. фашысты загубілі ў С. 53 чал., 40 чал. вывезены на катаржныя работы ў Германію.

СКРЫГА́Н Аляксандр Іосіфавіч (11.8.1905, в. Труханавічы Капыльскага р-на Мінскай вобл. — 28.8.1981), бел. хімік. Д-р хім. н. (1966), праф. (1968). Скончыў БСГА (1928) і Ленінградскую лесатэхн. акадэмію (1931). З 1932 у Ін-це хіміі, у 1959—79 у Ін-це фізікаарган. хіміі АН Беларусі (у 1944—76 заг. лабараторыі, у 1951—52 і 1967—70 нам. дырэктара). Навук. працы па хіміі драўніны, вывучэнні міжмалекулярных сувязей прыродных палімераў, каталітычнай дэлігніфікацыі раслінных тканак.

Тв.: Процессы превращения древесины и ее химическая переработка. Мн., 1981.

Я.**Скрыган**.

СКРЫГА́Н Ян (Іван Аляксеевіч; 16.11.1905, в. Труханавічы Капыльскага р-на Мінскай вобл. — 18.9.1992), бел. пісьменнік. Засл. работнік культуры Беларусі (1985). Вучыўся ў Слуцкім с.-г. тэхнікуме, БДУ (1928—32). У 1924—27 працаваў у слуцкай акруговай газ. «Вясковы будаўнік», заг. Нар. дома ў Расонах, у газ. «Чырвоная Полаччына», у 1933—36 у газ. «Літаратура і мастацтва». У 1936 рэпрэсіраваны, высланы ў Кемераўскую вобл. У 1946 вызвалены, працаваў на прамысл. прадпрыемстве ў г. Фергана (1946—48), у Эстоніі (1948—49). У 1949 зноў арыштаваны і высланы ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1954. З 1955 працаваў у Дзярж. выд-ве Беларусі, з 1959 у час. «Полымя», у 1967—75 заг. рэдакцыі ў «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі». У 1975—85 адказны сакратар К-та па Дзярж. прэміях Беларусі ў галіне л-ры, мастацтва і архітэктуры. Літ. дзейнасць пачаў у 1924 з вершаў. Быў чл. літ. аб'яднанняў «Маладняк», «Літаратурна-мастацкая камуна». Першае апавяданне «Таіса» (1927) напісана пад уплывам прыгодніцка-рамант. тэндэнцый, характэрных маладнякоўскай прозе. Аповесць «Затока ў бурах» (1929) — гіст. і псіхал. праўдзівы малюнак з жыцця бел. народа ў часы 1-й сусв. вайны і пазней. С. — адзін з пачынальнікаў бел. нарыса: «Новая зямля» (1929), зб-кі «Шугае сонца» (1930), «Недапісаны профіль» (1932). Зб. апавяданняў «Сустрэчы» (1935) — сведчанне пашырэння ідэйна-тэматычных далягляду пісьменніка, замацаванне прынцыпу аўтабіяграфізму як гал. структурнага кампанента сюжэта, вытоку лірызму, сродку выяўлення асабістай далучанасці да сучаснасці. У зб-ках «Апавяданні» (1956), «Наталя» (1957), «Няпрошаная сляза» (1958), «Скажы адно слова» (1961) тэма захавання і памнажэння духоўных набыткаў чалавека. Памяць як гал. сувязны гісторыі вызначае змест і сюжэтна-кампазіцыйны лад

кніг «Свая аповесць» (1964) і «Кругі» (1969) — уклад пісьменніка ў развіццё сучаснай маст.-дакумент. «спавядальнай» прозы. У зб-ках маст.-дакумент. артыкулаў і мемуараў «Ранішнія росы» (1965), «Некалькі хвілін чужога жыцця» (1979) постаці выдатных дзеячаў бел. л-ры, мастацтва і культуры ў злітнасці з эпохай і індывідуальнымі адметнасцямі. Лексічнае багацце, выкарыстанне скарбаў роднай мовы, інтанацыйная разнастайнасць фразы — характэрныя адзнакі стылю пісьменніка. Пісаў эсэ, маргіналіі, літ.-крытычныя арт. па пытаннях культуры творчасці, мовы. На бел. мову пераклаў раманы «Энергія» Ф.Гладкова, «Тры вымярэнні» Н.Агнёва, «Цусіма» А.Новікава-Прыбоя, «Выбранае» І.Буніна (1958), «Сустрэча з мінулым» К.Федзіна (1978), паасобныя творы А.Астроўскага, І.Бабеля, М.Булгакава, М.Горкага, А.Ганчара, Ю.Яноўскага, Э.Крустэна, Л.Промет, Ф.Тугласа, А.Упіта, Р.Ралана і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 1976 за ўдзел у стварэнні Бел. Сав. Энцыклапедыі.

Тв.: Выбр. тв. Т. 1—2. Мн., 1975; Выбр. тв. Т. 1—2. Мн., 1985.

Літ.: Сабаленка Р. Пад дажджом і сонцам. Мн., 1966; Гардзіцкі А. Дыялогі. Мн., 1968; Андраюк С. Вывяраючы жыццём. Мн., 1976; Шупенька Г. Цеплыня чалавечнасці. Мн., 1977; Жураўлёў В.П. Структура твора. Мн., 1978; Смолкін М. Кругі жыцця: Літ. партрэт Янкі Скрыгана // Полымя. 1975. №11; Васілевіч А. «Некалькі хвілін чужога жыцця...» // Там жа. 1980. №11; Лялько Х. Тварыць харасво // Маладосць. 1985. №11.

А.Ф.Лысенка.

СКРЫГА́НАЎ Вікенцій Васілевіч (22.6.1903, в. Надзейкавічы Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. — 26.1.1945), генерал-маёр (1944), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў пях. школу (1925), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1938). У Чырв. Арміі з 1920, удзельнік грамадз. вайны і баёў з інтэрвентамі на Зах. і Паўд. франтах. Да 1935 у войсках БВА: камандзір батарэі, нам. нач. штаба брыгады, нач. артылерыі палка. У Вял. Айч. вайну з 1942 на Зах., Паўд., Закаўказскім, Паўн.-Каўказскім, Паўд.-Зах., 3-м, 2-м і 1-м Укр. франтах: нам. камандзіра, камандзір стралк. дывізіі. Стралк. дывізія на чале з ген.-маёрам С. вызначылася на тэр. Польшчы, дзе за 11 дзён прайшла з баямі 264 км, фарсіравала Одэр. Памёр ад ран.

СКРЫ́ДЛЕВА, возера ў Віцебскім р-не, у бас. р. Чарнічанка (цячэ праз возера), за 18 км на Пд ад г. Віцебск. Пл. 0,76 км^2, даўж. 2,5 км, найб. шыр. 410 м, найб. глыб. 5,5 м, даўж. берагавой лініі каля 6 км. Пл. вадазбору 110 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы выш. 3—6 м, на ПдЗ да 9 м. Берагі нізкія, пясчаныя, на Пн і Пд забалочаныя, на ПдЗ зліваюцца са схіламі. Дно ў прыбярэжнай ч. пясчанае, глыбей гліністае. Паласа прыбярэжнай расліннасці шыр. да 50 м. Упадаюць ручай і меліярац. канава.

СКРЫЖАВА́ННЕ, аб'яднанне генет. матэрыялу розных клетак у адной клетцы; адзін з метадаў *селекцыі*. У раздзельнаполых арганізмаў С. адбываецца ў выніку зліцця спецыялізаваных клетак (*гамет*) і ўтварэння *зіготы*. У шэрагу аднаклетачных *эўкарыётаў* і *пракарыётаў* — шляхам часовай *кан'югацыі*, пры якім адбываецца ўзаемны ці аднабаковы перанос генет. матэрыялу паміж клеткамі. У культуры клетак і ў некат. аднаклетачных арганізмаў здольныя зліваццa неспецыялізаваныя клеткі. Адрозніваюць зваротнае С. (*бекрос*), аналітычнае, рэцыпрокнае, блізкароднаснае (*інбрыдзінг, інцухт*), няроднаснае (*аўтбрыдзінг*), цыклічнае і інш. Формы і сістэма пэўнага С. выкарыстоўваюцца ў генет. аналізе, пры развядзенні і селекцыі жывёл і раслін.

Р.Г.Заяц.

СКРЫЖАВА́ННЕ МАЎ, тэрмін, якім раней пазначалі адзін з відаў моўнай *канвергенцыі*.

СКРЫЖА́ЛІ, дзве каменныя дошкі, на якіх, згодна з біблейскай міфалогіяй, напісаны 10 запаведзей, перададзеных богам Яхве Маісею на г. Сінай. У пераносным значэнні С. наз. тое, што захоўваецца: занатаваныя памятныя падзеі, даты, імёны, ідэі і інш.

СКРЫ́НЯ, 1) від мэблі; тое, што *куфар*. 2) Дашчаная або плеценая ёмістасць для захоўвання збожжа. Мела розныя памеры, часам — некалькі адсекаў. Найчасцей С. ставілі ў свірне, каморы, радзей у сенцах. У ёй захоўвалі жыта, ячмень, гарох, авёс і інш. С. звычайна зверху зачыняліся вечкам. 3) У зах. раёнах Беларусі дашчаная ёмістасць, у якой перавозяць бульбу.

СКРЫ́ПАВА Ларыса Віктараўна (н. 30.5.1946, г. Кызыл, Расія), бел. вучоны ў галіне паразіталогіі. Д-р біял. навук (1997). Скончыла Кызыльскі ун-т (1973). З 1986 у Бел. НДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі. Навук. працы па пытаннях паразіталогіі і паразітарных хвароб.

Тв.: Выявление очагов описторхоза в Белоруссии (у саўт.) // Мед. паразитология и паразитарные болезни. 1991. №3; Роль системы коммунального водоснабжения в распространении лямблиоза (разам з М.А.Раманенкам, Г.І.Навасільцавым) // Здравоохранение Беларуси. 1993. №3.

В.В.Скрыганаў.

СКРЫ́ПЕНЬ (Epilobium), род кветкавых раслін сям. скрыпнёвых. Каля 200 відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ва ўмерана цёплых абласцях. На Беларусі 11 відаў. Найб. вядомыя С.: балотны (E. palustre), валасісты (E. hirsutum), горны (E. montanum), драбнакветкавы (E. parviflorum), жылкаваты (E. nervosum). Трапляюцца на высечках, лясных палянах, уздоўж дарог.

Шмат-, радзей аднагадовыя травяністыя расліны выш. да 60 см. Сцёблы густа ўкрытыя лісцем, цыліндрычныя, малагалінастыя. Лісце чаргаванае або супраціўнае, зубчастае. Кветкі ружовыя, чырв., белыя, у доўгай канцавой гронцы або ў пазухах лісця. Плод — каробачка. Дэкар., лек., меданосныя расліны.

А.М.Скуратовіч.

Скрыпень: 1 — валасісты; 2 — горны; 3 — балотны.

СКРЫПІ́ЦА, млечнік апушаны (Lactarius vellereus), шапкавы базідыяльны грыб сям. сыраежкавых. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн. Амерыцы. На Беларусі трапляецца з ліп. па вер. у хвойных і мяшаных лясах (часцей у ельніках).

Пладовае цела — шапка на ножцы. Шапка спачатку плоская, потым лейкападобная з загнутым уніз хвалістым краем, дыяметрам 7—20 см, тонкаапушаная, сухая, белая, з бураватым адценнем. Мякаць з млечным сокам, белая, потым жаўтаватая, шчыльная, горкая на смак. Пласцінкі белаватыя, каротка-зыходныя. Ножка цыліндрычная, суцэльная, гладкая, выш. да 7 см. Споры бясколерныя, авальныя. Ядомая. Гл. іл. да арт. *Млечнік*.

СКРЫПІ́ЦА, рака ў Жыткавіцкім р-не Гомельскай вобл., левы прыток р. Прыпяць. Даўж. 36 км. Пл. вадазбору 360 км^2. Пачынаецца за 1,5 км на ПдУ ад в. Лагвошчы, вусце за 2 км на ПнЗ ад в. Перапроў. Асн. прытокі Гніліца і Навуць (злева). Цячэ па нізіне Прыпяцкае Палессе. Даліна на ўсім працягу невыразная. Пойма роўная, на невял. участку ў сярэднім цячэнні ўзгорыстая. Рэчышча ад вытоку на працягу амаль 25 км каналізаванае, злучае ланцуг невял. старычных азёр у пойме р. Прыпяць.

СКРЫ́ПКА (стараслав. скрыпіца ад скрыпець, рыпець), 4-струнны смычковы муз. інструмент. Найб. высокі па тэсітуры сярод скрыпічных інструментаў, да якіх адносяцца таксама *альт* і *віяланчэль*. Агульная даўжыня С. каля 600 мм. Яе авальны корпус з выразамі па баках («талія») складаецца з 2 злёгку выпуклых драўляных пласцін — дэк, замацаваных абечкам. Дыяпазон больш за 4 актавы (g—c^5). Гук здабываецца смыкам, зрэдку шчыпком (pizzicato); ужываюцца і флажалеты (вылучэнне асобных абертонаў лёгкім дакрананнем пальца ў месцы парцыяльнага падзелу струны). Існуюць прыёмы змены тэмбру. С. мае выразны маляўнічы гук, багатыя тэхн. магчымасці, з'яўляецца асновай сімфанічнага аркестра, многіх відаў камерных ансамбляў, адзін з самых папулярных сольных інструментаў.

Скрыпка.

Як прафес. муз. інструмент выкарыстоўваецца з канца 15 ст. Да гэтага часу ў Польшчы закончыўся працэс фарміравання т.зв. «перадкласічнага» тыпу С. На працягу 15—16 ст. з улікам нар. вопыту па вырабе С. і ўдасканалення іх майстрамі Італіі, Польшчы і Францыі выпрацавана класічная С. У 16—18 ст. у розных краінах Еўропы склаліся буйныя школы майстроў па вырабе С.: Дж.П.Маджыні, А. і Н. Амаці, Дж.Гварнеры дэль Джэзу, А.Страдывары, Дж.Б.Гваданьіні, А.Гальяна ў Італіі; М.Гробліч, Б.Данкварт у Польшчы; Я.Штайнер, сям'я Клоц у Германіі і інш. Канструкцыя С. канчаткова акрэслілася ў творчасці італьян. майстроў. Сярод найб. вядомых майстроў 19 ст.: Ж.Б.Вільём у Францыі, браты Хіл у Вялікабрытаніі, І.А.Батаў у Расіі. У 20 ст. вылучаюцца інструменты рас. скрыпічных майстроў Я.Ф.Вітачака, Г.А.Марозава, Ц.П.Падгорнага, М.М.Фралова, Д.П.Тамашова і інш. У 17—18 ст. склаліся скрыпічныя жанры, у т.л. сольныя санаты і канцэрт. Сольнае скрыпічнае выканальніцтва пачыналася на фарміраванне нац. школ: італьян. (А.Вівальдзі, Ф.Джэміньяні, П.Лакатэлі, Дж.Тарціні, Г.Пуньяні), франц. (Ж.Б.Люлі, Ж.М.Леклер, П.Гавінье, Дж.Б.Віёці), польскай (А.Яжэмбскі, Ф.Дураноўскі, Ф.Яневіч), чэшскай (Ф.Бенда, Я.Стаміц, П. і А. Враніцкія), ням. (І.Вальтэр, І.Вестгоф), аўстр. (Г.І.Фібер, К.Дзітэрсдорф). У 19 ст. вял. ролю ў развіцці скрыпічнага выканальніцтва адыграла творчасць італьянца Н.Паганіні. Сярод вядомых рас. скрыпачоў 20 ст. Л.Коган, Д.Ойстрах, В.Клімаў, В.Трацюкоў і інш.

На Беларусі (паводле даследаванняў В.Грыгор'ева) ужо ў 14 ст. былі пашыраны 3-струнныя смычковыя інструменты пад назвай «скрыпіца», «скрыпель», настроеныя па квінтах, з многімі прыкметамі С. Першыя ўпамінанні С. ў бел. пісьмовых помніках — найб. ранія ў Еўропе. Сярод бел. майстроў 19 ст. па вырабе С.: Сянкевіч з Рэчыцы, З.Навіцкі з Мінска; у 20 ст. — А.Чайкоў, У.Крайко і інш. Прафес. скрыпічнае выканальніцтва на Беларусі вядома з 18 ст.: Л.Сітанскі (Гродна), Ф.Стамплоўскі (Слонім), Я.Ценціловіч і Мацей з Карэліч (Нясвіж). Сярод бел. скрыпачоў 19 — пач. 20 ст.: І.Дабравольскі, М.Ельскі, К.Кжыжаноўскі, Н.Рубінштэйн, Я.Чыжэўскі, Б.Юзафовіч, у 20 ст. — А.Амітон, С.Асновіч, М.Браценнікаў, А.Бяссмертны, Л.Гарэлік, Ю.Гершовіч, Г.Клачко, А.Крамароў, В.Сарока і інш. Сярод лепшых твораў бел. кампазітараў для С. канцэрты Г.Гарэлавай, П.Падкавырава, Дз.Смольскага, Р.Суруса, санаты А.Багатырова, Э.Тырманд, мініяцюры Л.Абеліёвіча, Г.Вагнера, Я.Глебава, У.Дарохіна, М.Чуркіна і інш. У нар. побыце С. цесна звязана з традыц. земляробчымі і сямейнымі абрадамі, ігрышчамі, вечарынкамі, бяседамі, паказамі нар. т-ра батлейка. С. — адзін з найб. любімых інструментаў беларусаў, пра яе складзены казкі, легенды, загадкі, песні. Выкарыстоўваюцца С. фабрычныя і самаробныя. Нар. тэхніка ігры на С. мае асаблівасці, абумоўленыя спосабам трымання інструмента і вядзення смычка, выкарыстаннем пераважна 3 струн. Сярод скрыпічных майстроў 20 ст.: І.Дударэвіч (г. Баранавічы Брэсцкай вобл.), У.Жукоўскі (в. Пухавічы Мінскай вобл.), В.Шышко (в. Бершты Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл.) і інш.; нар. скрыпачоў — П.Жаканаў (в. Вярбоўка Чавускага р-на Магілёўскай вобл.), В.Малыш (пас. Забіяка Гомельскага р-на), М.Семянчук (в. Гарадзец Столінскага р-на Брэсцкай вобл.), П.Тупіцын (в. Кашаны Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл.), М.Тысевіч (в. Аброва Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл.), М.Шкадун (в. Глушкавічы Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.) і інш.

Літ.: Витачек Е.Ф. Очерки по истории изготовления смычковых инструментов. 2 изд. М. 1964; Ямпольский И. Русское скрипичное искусство. Т. 1. М.; Л., 1951; Назина И.Д. Белорусские народные музыкальные инструменты: Струнные. Мн., 1982. *А.Л.Капілаў, І.Дз.Назіна.*

СКРЫ́ПКА, у беларусаў традыц. прылада для зімовай лоўлі рыбы; стаўная пастка ў выглядзе аднагорлавага *бучa* з прыбудаваным да ўваходу карытцам. Наз. таксама кош. С. ставілі ў палонцы на неглыбокім месцы так, каб карытца знаходзілася ў адкрытай вадзе, а конус — пад лёдам. Рыба, што з-за недахопу кіслароду ў вадзе імкнулася да паверхні вадаёма, трапляла ў карытца, а пасля, шукаючы выхаду з яго, праз горла заходзіла ў буч. Як і пры лоўлі *каробкамі*, палонку закрывалі галінкамі, сенам і снегам (каб не замярзала вада). Рыбачылі С. на Палессі, вядома таксама на Магілёўшчыне і ПнУ Гомельшчыны. *І.М.Браім.*



Скрыпка.

СКРЫ́ПКА Міхась (Міхаіл Аляксандравіч; 26.11.1907, в. Месціна Бярэзінскага р-на Мінскай вобл. — 8.10.1991), бел. пісьменнік-сатырык. Вучыўся ў Мінскім пед. ін-це (1937—41). Настаўнічаў (1930—41, 1945—62). У 1965—71 нам. дырэктара бюро прапаганды маст. л-ры Саюза пісьменнікаў Беларусі. Друкаваўся з 1927. Першы зб. баек і вершаў «Сатыра і гумар» (1958). Аўтар кніг апавяданняў і гумарэсак «Мая хата не з краю» (1959), «Пад корань» (1962), «Усяк бывае...» (1963), зб. апавяданняў для дзяцей «Дзіва ў рэшаце» (1963); каля 30 аднаактовых камедый, у т.л. «На

сваю галаву», (1966), «Акадэмік» (1970), сцэнарыя кароткаметражнай кінакамедыі «Акадэмік» (паст. 1963), зб. антырэліг. нарысаў «Сцеражыцеся цемрашалаў!» (1964). На бел. мову пераклаў паасобныя творы С.Алейніка, А.Барто, А.Вішні, С.Маршака, С.Міхалкова, А.Твардоўскага і інш.

Тв.: Сатырычны калаўрот. Мн., 1967; Пад смешнай вясёлкай. Мн., 1971; Ад смеху не ўцячэш. Мн., 1975; І з перцам і з сэрцам. Мн., 1977; Шануючы вас... Мн., 1982; Дзіва ў кошыку. Мн., 1983; Злазьце — прыехалі: Байкі, гумарэскі, фельетоны. Мн., 1985; З сэрцам і перцам: Байкі, вершы, фельетоны, мініяцюры. Мн., 1987.

СКРЫПЛЯ́ЦА, вёска ў Кіраўскім р-не Магілёўскай вобл., каля р. Добасна і аднайм. вадасховішча. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 15 км на У ад г.п. Кіраўск, 85 км ад Магілёва, 43 км ад чыг. ст. Бярэзіна. 578 ж., 192 двары (2001). Сярэдняя школа, Палац культуры, б-ка, аддз. сувязі.

СКРЫПЛІ́ЦА, вадасховішча ў Кіраўскім р-не Магілёўскай вобл., каля в. Скрыпліца. Створана ў 1981. Пл. 0,73 км^2, даўж. 1 км, найб. шыр. 1 км, найб. глыб. 5 м, аб'ём вады 1,4 млн. м^3. Даўж. агараджальнай дамбы 1,1 км. Наліўное. Напаўняецца вадой з р. Добасна па водападвадным канале. Ваганні ўзроўню вады на працягу года 1,5 м. Выкарыстоўваецца для арашэння с.-г. угоддзяў, рыбагадоўлі, воднага добраўпарадкавання прылеглых тэрыторый.

СКРЫПНЁВЫЯ, аслінніка вы я (Onagraceae), сямейства двухдольных кветкавых раслін парадку міртавых. Больш за 20 родаў, каля 700 відаў. Пашыраны ўсюды, найб. ва ўмераных і субтрапічных паясах. На Беларусі каля 25 відаў з родаў *асліннік, двухпялёснік, скрыпень*, іван-чай (капорскі чай). Шэраг відаў з родаў кларкія і *фуксія* культывуюць у садах, парках, аранжарэях і пакоях.

Пераважна шматгадовыя травы, радзей кусты, паўкусты ці невял. дрэвы. Лісце чаргаванае або супраціўнае, суцэльнае, звычайна ланцэтнае, суцэльнакрайняе ці зубчастае. Кветкі двухполыя, адзінкавыя або сабраныя ў суквецце ў пазухах лісця. Плод — каробачка, радзей арэхападобны ці ягадападобны. Лек., харч., дэкар., меданосныя і кармавыя расліны, некат. — пустазелле.

Літ.: Травянистые растения СССР. Т. 2. М., 1971; Жизнь растений. Т. 5 (ч. 2). М., 1981. *А.М.Скуратовіч.*

СКРЫ́ПНІК Віталь Міхайлавіч (н. 17.1.1936, с. Налобіха Касіхінскага р-на Алтайскага краю, Расія), бел. вучоны ў галіне радыётэхнікі і электронікі. Д-р тэхн. н. (1983), праф. (1984). Скончыў Мінскае вышэйшае інж. радыётэхн. вучылішча ППА (1965), дзе і працаваў (у 1974—87 заг. кафедры). З 1987 у БДУ, з 1996 прарэктар Ін-та сучасных ведаў, з 2000 — Бел. камерцыйнага ун-та кіравання. Навук. працы па тэорыі і выкарыстанні складаных радыётэхн. сістэм, распрацоўцы метадаў і спосабаў ацэнкі іх тэхн. стану, надзейнасці і даўгавечнасці.

Тв.: Хранение радиотехнических систем в эксплуатационных условиях. М., 1984 (разам з Ю.І.Крычэўскім, П.А.Раманцом); Альтернативные испытания малых выборок на надежность. Мн., 1986 (разам з А.Л.Грэчыным); Анализ надежности технических систем по цензурированным выборкам. М., 1988 (у саўт.). *М.П.Савік.*

СКРЫПНІЧЭ́НКА Георгій Сяргеевіч (н. 12.11.1940, г. Мікалаеў, Украіна), бел. мастак. Скончыў Мінскае маст. вучылішча (1966). У 1970—74 працаваў ва Усесаюзным НДІ тэхн. эстэтыкі. Творам уласціва сюррэалістычная скіраванасць. Метафарычнасцю маст. мовы, стылізатарскай разнастайнасцю, кампазіцыйнай завершанасцю, колеравай насычанасцю вылучаюцца трыптыхі: «Мірная зямля», «Вобразы мілыя роднага краю» (абодва 1981), карціны «Адчуванне Радзімы» (1969), «Жакей» (1982), «Алегорыя свету» (1984), «Прысвячэнне М.Селешчуку» (1986), «Экалагічная раўнавага» (1989), «Скарына на Радзіме», «Як справы ў Чарнобылі?» (1990), «Страчаныя мары» (1991), «Смутак» (1990—95), «Апошнія гульні» (1995), «Памяркоўны», «Час майго жыцця» (абедзве 1996), «Забруджаная зямля» (1997), «Да 200-годдзя А.Міцкевіча» (1998), «Суіснаванне» (1980—2000), «Ланцуг жорсткасці» (2000), «Гальшаны», «Радзіма Ф.Рушчыца—Вішнева, Багданава» (абедзве 2001), серыя «Мастакі Айчыне» (1994—97). Аўтар графічных работ «Выдатныя дзеячы беларускай культуры» (1979), «Метамарфозы» (паводле твораў В.Дуніна-Марцінкевіча; 1983). *Л.Ф.Салавей.*

Г.Скрыпнічэнка. Адчуванне Радзімы. 1969.

Л.Скрыпнічэнка. Паўлінка. 1981.

СКРЫПНІЧЭ́НКА Ларыса Іванаўна (н. 7.7.1941, г. Усевалажск Ленінградскай вобл.), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Скончыла Мінскае маст. вучылішча (1964), выкладала ў ім (1980—92). З 2001 у Мінскім раённым цэнтры дзіцячай творчасці. Сярод твораў габелены, выкананыя пераважна спалучэннем тэхнік гладкатканага і рэльефнага ткацтва: «Лясная песня» (1974), «Саната» (1977), «Світанне» (1978), «Кавальасілак» (1979), «Сонечная кветка», «Абуджэнне» (абодва 1980), «Паўлінка» (1981), «След Пегаса» (1982), «Святочны рытм» (1984), «Веснавы акорд», «Багацце» (серыя; усе 1985), «Раніца» (1986), «Прэлюдыя», «Прысвячэнне» (1988—89), «Прастора і час», «Гімн зямлі» (абодва 1988), «Усход Селены», «Веснавыя галасы» (абодва 1991), «Нітка Арыядны» (1995), «Русалка», «Папараць» (абодва 1997); дэкар. пано «Ураджай» для Палаца культуры ў в. Сеніца Мінскага р-на (1990) і інш. Працуе таксама ў станковым жывапісе.

СКРЫПТО́РЫЙ (позналац. scriptorium ад лац. scriptor перапісчык, пісец), сярэдневяковая майстэрня па вырабе *рукапісных кніг*. У 6—15 ст. С. былі пашыраны ў Еўропе. Стваральнікам першага еўрап. С. (540-я г.) лічыцца гісторык остготаў Касіядор. У канцы 6—7 ст. С. ствараліся па ўсёй Еўропе (Верона, Ліён, Санкт-Гален, Кёльн, Фульда, Сен-Марцыял, Корбі і інш.), у якіх пазней выпрацаваліся асн. тыпы сярэдневяковага пісьма. Найб. вядомасцю пры Карле Вялікім карыстаўся С. Турскага манастыра св. Марціна. У 9 ст. некалькі С. меў манастыр бенедыкцінцаў у Клюні (Бургундыя), рукапісы якіх вызначаліся выразнасцю пісьма, вельмі чорным чарнілам і своеасаблівай арнаментыкай. З канца 12 ст. С. сталі выцясняцца гар. цэхавымі майстэрнямі, якія працавалі

на заказ і на рынак. С. заняпалі са з'яўленнем *кнігадрукавання*. У С. існаваў падзел працы: з узорнага арыгінала спісвалі перапісчыкі, аздобу выконвалі ілюмінатары, часта пры С. працавалі пераплётныя майстэрні. На землях ВКЛ існавалі мітрапаліцкі, дзяржаўны, манастырскія і прыватныя С. Першыя С. вядомы ў 14—15 ст. у правасл. манастырах і пры двары кіеўскіх мітрапалітаў (да іх прадукцыі можна аднесці Евангелле-апракас сярэдзіны 14 ст. і *Лаўрышаўскае евангелле* пач. 14 ст.). Мітрапаліцкі С. упамінаецца дыяканам Якімцом пад 1512 пры саборнай царкве Барыса і Глеба ў Навагрудку. З развіццём дзяржавы развіўся ін-т Дзярж. канцылярыі ВКЛ, якой кіраваў *канцлер*. Яму і яго намесніку (падканцлеру) падпарадкоўваліся лац. і рус. *пісары*. Пісару падпарадкоўваліся дзякі, якія вялі справаводства, перапісвалі акты, тыражыравалі неабходныя для дзяржавы кнігі. Асн. прадукцыя, якая выходзіла са С. велікакняжацкай канцылярыі, былі спісы Статутаў, хаця шэраг прафес. пісцоў мог спісаць любыя кнігі на заказ. У 15 ст. існаваў С. пад пратэкцыяй кн. Алелькавічаў у Слуцкім Траецкім манастыры. Адна з кніг, перапісаная ў ім, захавалася да нашага часу. Значным цэнтрам вырабу кніг быў Смаленск. Пры смаленскім епіскапе Іосіфе Солтане створаны ілюмінаваны спіс *Радзівілаўскага летапісу*. У 1495 у Смаленску перапісаны *Аўрамкі летапіс* з рыфмаваным панегірыкам Вітаўту (гл. «*Пахвала Вітаўту*»). Найб. вядомыя манастырскія С.: Полацкі, Куцеінскі, Чарэйскі, Лешчанскі, Супрасльскі. У ВКЛ рукапісныя кнігі выраблялі амаль у кожным каталіцкім кляштары. Часта кнігапісанне бралі пад сваю апеку прыватныя асобы, найчасцей буйныя магнаты. Найбольшы з прыватных С. дзейнічаў у канцы 15 — 1-й пал. 16 ст. ў двары Солтанаў у прадмесці Вільні — Шышкінях (зараз у межах горада). Радзівілы і інш. бел. магнаты таксама мелі свае канцылярыі са штатам канцылярыстаў-кнігапісцаў.

Літ.: Киселева Л.И. О чем рассказывают средневековые рукописи. Л., 1978; Нікалаеў М. Палата кнігапісная: Рукапісная кніга на Беларусі ў X—XVIII стст. Мн., 1993.

М.В.Нікалаеў.

СКРЫПУНЫ́ (Saperda), род жукоў сям. вусачоў. Каля 30 відаў. Пашыраны ўсюды, пераважаюць у Паўн. паўшар'і. Трапляюцца на лісцевых пародах дрэў (таполях, вербах і інш.). На Беларусі 11 відаў, найб. пашыраны С. малы асінавы (S. populnea).

Даўж. 10—30 мм. Цела цыліндрычнае, зверху — у густых валасках, звычайна рознакаляровых. Пры раздражненні выдаюць гучны характэрны скрып (адсюль назва). Многія — шкоднікі дрэў.

СКРЫТАЖА́БРАВЫЯ, гіганцкія саламандры (Cryptobranchidae), сямейства хвастатых земнаводных. Вядомы з міяцэну (25—7 млн. г. назад). 2 роды, 3 віды. Пашыраны ва Усх. Кітаі, Японіі і паўд.-ўсх. ч. Паўн. Амерыкі. Жывуць у рэках, горных ручаях. Кітайская (Andrias davidianus) і японская (A. japonicus) гіганцкія саламандры занесены ў Чырв. кнігу МСАП.

Даўж. да 1,8 м, маса да 70 кг. Цела пляскатае, галава вял., плазаватая, рот шырокі. На пярэдніх нагах па 4 пальцы, на задніх па 5. Хвост доўгі, сціснуты з бакоў. У дарослых захоўваюцца 2—4 жабравыя дугі. Кормяцца рыбай, земнаводнымі і воднымі беспазваночнымі. Азіяцкія віды амаль вынішчаны.

СКРЫТАШЫ́ЙНЫЯ ЧАРАПА́ХІ (Cryptodira), падатрад паўзуноў атр. чарапах. 8 сям., каля 50 родаў, 148 відаў. Вядомы з трыясу, паходзяць ад *катылазаўраў*. Пашыраны амаль усюды, акрамя Антарктыды. Большасць вядуць паўводны спосаб жыцця. На Беларусі 1 від — *балотная чарапаха*, занесеная ў Чырв. кнігу.

Даўж. панцыра ад 10 да 150 см, маса да 400 кг (*слановыя чарапахі*). Цела ўкрыта панцырам, які складаецца са спіннога (карапакс) і брушнога (пластрон) шчытоў. Здольныя ўцягваць шыю (адсюль назва) і галаву пад панцыр, пры гэтым выгінаюць шыю S-падобна ў верт. плоскасці. Тазавыя косці не зрошчаныя з панцырам. Пластрон укрыты 11—12 рагавымі шчыткамі. Адкладваюць яйцы на сушы. Кормяцца расл. і жывёльным кормам. Жывуць зрэдку да 150 гадоў. Некат. віды ў Чырв. кнізе МСАП. Асобныя віды — аб'екты развядзення і промыслу (выкарыстоўваюць мяса, тлушч, яйцы, рагавыя шчыткі. Іл. гл. да арт. *Чарапахі*.

СКРЫЎЛЁННЕ ПАЗВАНО́ЧНІКА, скаліёз, бакавое скрыўленне *пазваночніка* (у франтальнай плоскасці). Бывае прыроджанае і набытае. Развіваецца ў выніку парушэнняў структуры пазваночніка, змяшчэння цэнтра цяжару цела ў бок ад падоўжнай восі. Бывае пры рахіце, траўмах, пухлінах, запаленнях пазваночніка і інш. У 90% выпадкаў назіраецца ідыяпатычнае С.п. (парушэнне абмену ў злучальнай тканцы, што вядзе да аслаблення сувязі міжпазванковых дыскаў з пазванкамі). Пры С.п. адзначаецца дэфармацыя грудной клеткі, змяншэнне яе аб'ёму і ўтварэнне рэбернага гарба, парушэнне функцый лёгкіх і сардэчна-сасудзістай сістэмы. Лячэнне: лячэбная фізкультура, масаж, хірургічнае. *І.М.Семяненя.*

СКРЭБ (англ. scrub), зараснікі невысокіх (1—2 м) пераважна вечназялёных цвердалістых засухаўстойлівых кустоў са слабаразвітым травяністым покрывам. Пашыраны ў субтрапічных і часткова трапічных абласцях Паўд.-Зах. і Усх. Аўстраліі, Паўд. Афрыцы і на Пд ЗША. У складзе С. ў асн. акацыі, нізкарослыя эўкаліпты, казуарыны, рэдкія невысокія дрэвы, кусцікі з сям. бабовых і міртавых; у разрэджаным травяным покрыве — дзернавінныя злакі, аднагадовыя сухацветы, салянкі, некат. сукуленты.

СКРЭ́БЛА, каменная прылада працы, якая служыла для апрацоўкі скур і вырабаў з дрэва. Былі пашыраны ў *палеаліце*, асабліва ў эпоху *мусцье*. С. выраблялі пераважна з масіўных авальных, падпрамавугольных і няправільных абрысаў адшчэпаў ці пласцін; арыентацыя лёзаў падоўжаная ці папярочная. Вылучаюцца адзінарныя і двайныя тыпы С. На Беларусі найб. стараж. С. знойдзены ў *Абідавічах*, Клеявічах і *Свяцілавічах*.

Да арт. **Скрытажабравыя.** Кітайская гіганцкая саламандра.

СКРЭ́БНІ, скрэбені, калючагаловыя чэрві, акантацэфалы (Acanthocephala), клас паразітычных першаснаполасцевых чарвей (існуюць інш. класіфікацыі). Каля 1500 відаў. На Беларусі 11 відаў, найб. вядомыя акантацэфалус гусіны (Acanthocephalus anguillae), макракантарынхус п'яўкавы (Macracanthorhynchus hirudinaceus), паліморфус вялікі (Polymorphus magnus) і інш. Паразіты кішэчніка пазваночных жывёл (канчатковыя гаспадары), узбуджальнікі *акантацэфалёзаў*.

Даўж. да 68 см, цела двухбаковасіметрычнае, верацёнападобнае, укрыта кутыкулай, у некат. відаў з шыпікамі. Пярэдні канец цела ператвораны ў орган прымацавання — хабаток з хіцінавымі кручкамі. Крывяносная, дыхальная і стрававальная сістэмы адсутнічаюць, нерв. складаецца з галаўнога нерв. вузла і парных прадаўгаватых тулаўных ствалоў. Жыўленне асматычным шляхам. Раздзельнаполыя. Развіццё з метамарфозам і зменай гаспадароў. Прамежкавыя гаспадары — ракападобныя, малюскі і насякомыя.

СКРЭ́ПЕР (англ. scraper ад scrape скрэбці), землярыйна-транспартная машына цыклічнага дзеяння для паслойнага зразання, транспартавання, адсып-



Скрэпер самаходны МаАЗ-6014 (Магілёўскі аўтамабільны завод).

кі ў насып ці адвал і разраўноўвання грунту. Рабочы орган С. — коўш з нажом, які загружаецца свабодна пад дзеяннем цягавага намагання пры руху машыны або прымусова канвеерам (напр., элеватарам) з аўтаматызаваным кіраваннем.

Бываюць прычапныя да трактара (2- або 1-восевай канструкцыі), паўпрычапныя на базе 2-восевых трактароў і цягачоў, самаходныя на базе аднавосевых цягачоў, у т.л. з дызель-эл. прыводам і матор-коламі. Умяшчальнасць каўша да 40 м^3 і больш, адлегласць транспартавання грунту да 2,5 км і больш. С. наз. таксама рабочы орган (коўш) канатна-скрэперных установак, якія выкарыстоўваюцца на экскавацыйных, трансп. і інш. земляных работах на паверхні, пад зямлёй і пад вадой. Прывод каўша — ад лябёдкі праз сістэму канатаў і блокаў. На Беларусі С. выпускае Магілёўскі аўтамаб. з-д. *І.І.Леановіч.*

У.А.Скугар.

СКУАРЦЫ́НА (Squarzina) Луіджы (н. 18.2.1922, г. Ліворна, Італія), італьянскі рэжысёр і драматург. Скончыў Нац. акадэмію драм. мастацтва ў Рыме (1946). У 1952 арганізаваў і ўзначаліў (сумесна з В.*Гасманам*) «Тэатр італьянскага мастацтва» ў Рыме, з 1962 кіраўнік (з І.К'езай) «Тэатра стабіле» ў Генуі, у 1977—84 — «Тэатра стабіле» ў Рыме. Паставіў спектаклі ў драм. і оперных т-рах («Ла Скала» ў Мілане, Рымскай оперы): «Гамлет» У.Шэкспіра (1952, сумесна з Гасманам), «Дачка Іорыо» Г. Д'Анунцыо (1957), «Федра» І.Піцэці (1959), «Фальстаф» Дж.Вердзі (1960), «Чалавек і звышчалавек» Б.Шоу і «Кожны па-свойму» Л.Пірандэла (1961), п'есы К.Гальдоні, Ф.Дастаеўскага і інш. Аўтар п'ес «Тры чвэрці месяца» (1953), «Сусветная выстаўка» (1955), «Дзяўчына з Раманы» («Раманьёла», 1957), «Пяць дзён у порце» (1968, сумесна з В.Фаджы), «8 верасня» (1972, сумесна з Э. дэ Бернартам і Р.Дзанграндзі) і інш.

СКУ́ГАР Уладзімір Антонавіч (н. 15.7.1914, в. Жабыкі Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Ейскае ваенна-марское авіявучылішча (1938), Ваенна-марскую акадэмію (1955). У ВМФ з 1935. У Вял. Айч. вайну з 1941 лётчык ВПС Чарнаморскага флоту. Удзельнік абароны Адэсы, Севастопаля, Паўн. Каўказа. Нам. камандзіра эскадрыллі капітан С. да студз. 1944 зрабіў 295 баявых вылетаў на далёкую паветр. разведку партоў, аэрадромаў, марскіх камунікацый праціўніка. Ў 1961—77 у грамадз. авіяцыі.

СКУГАРЭ́ЎСКАЯ Алена Іванаўна (н. 13.12.1938, г. Краснадар, Расія), бел. вучоны ў галіне псіхіятрыі і наркалогіі. Д-р мед. н. (1991), праф. (1993). Скончыла Мінскі мед. ін-т (1962), дзе і працуе. Асн. навук. працы па праблемах наркалогіі, сацыяльна-псіхалагічных пытаннях.

Тв.: Эмоции и алкоголизм. Мн., 1987; Экологический аспект в оценке алкогольной зависимости // Экологическая антропология. Мн., 1999; Медико-социальный аспект агрессии неокультов (разам з А.А.Скугарэўскім) // Беларусь: вчера, сегодня, завтра. Мн., 2001.

СКУ́ІНЬ, Скуіньш (Scujiņš) Зігмундс (н. 25.12.1926, Рыга), латышскі пісьменнік. Засл. дз. культ. Латвіі (1973). Нар. пісьменнік Латвіі (1985). Друкуецца з 1949. Аўтар раманаў «Унукі Калумба» (1961, Дзярж. прэмія Латвіі 1965, экранізаваны ў 1965 пад назвай «Да восені далёка»), «Серабрыстыя воблакі» (1967), «Мужчына ў росквіце гадоў» (1974), «Мемуары маладога чалавека» (1981), «Выхад злодзея сэрцаў» (2001), аповесцей «Гарнастай на асфальце», «Вялікая рыба» (абедзве 1980), апавяданняў, навел, нарысаў, эсэ, успамінаў і інш. Яго прозе ўласцівы лаканічны, трапны стыль, напружаныя афарыстычныя дыялогі, незвычайныя параўнанні, цікавыя партрэты. На бел. мову асобныя апавяданні С. перакладалі В.Рабкевіч, В.Сёмуха, А.Ставер.

Тв.: Рус. пер. — Бальзам. М., 1976; Нагота. Рига, 1981. *М.Абала.*

СКУ́ЛМЕ (Skulme) Ота (8.8.1889, г. Екабпілс, Латвія — 22.3.1967), латвійскі жывапісец. Нар. маст. Латвіі (1959). Чл.-кар. АМ СССР (1954). Вучыўся ў студыях Я.Розентала ў Рызе (1906—07), Р.Жукоўскага і К.Юона ў Маскве (1907—08), вучылішчы Штыгліца ў С.-Пецярбургу (1909—14). У 1926—47 гал. мастак латв. Маст. т-ра імя Я.Райніса ў Рызе, у 1944—61 рэктар Латв. АМ. Пісаў у сакавітай жывапіснай манеры нацюрморты, пейзажы, жанравыя карціны («Вандроўны музыкант», 1928), творы гісторыка-рэв. тэматыкі («Паўстанне каугурцаў», 1945). Афарміў больш за 250 спектакляў у т-ры імя Райніса, у т.л. «Агонь і ноч» Райніса (1947; Дзярж. прэмія СССР 1947).

Літ.: Лацис Р. Отто Скулме. М., 1959; Станковая и театральная живопись О.Скулме с 1920 по 1963 г.: [Каталог]. Рига, 1964.

СКУ́ЛТЭ (Skulte) Адолфс (н. 28.10.1909, Кіеў), латышскі кампазітар, педагог. Нар. арт. СССР (1979). Скончыў Латвійскую кансерваторыю ў Рызе (1934), з 1936 выкладаў у ёй (з 1952 праф.). Вучань Я.*Вітала*. Аўтар пераважна буйных сімф. і муз.-сцэн. твораў: опера «Прынцэса Гундэга» (паст. 1971), балеты «Сакта свабоды» (паст. 1950), «Навальніца вясной» (паст. 1967), кантаты, 9 сімфоній (1954—86), камерная, хар. музыка і інш. Дзярж. прэміі СССР 1950, 1951. Дзярж. прэмія Латвіі 1976.

СКУ́ЛЬПТАР (лац. Sculptor), сузор'е Паўд. паўшар'я неба. Найб. яркія зоркі 4,0 візуальнай *зорнай велічыні*. У С. знаходзіцца Паўд. полюс *Галактыкі*. З тэр. Беларусі відаць часткова (найлепш у вер.— кастр.). Гл. *Зорнае неба*.

СКУЛЬПТУ́РА (лац. sculptura ад sculpo выразаю, высякаю), від выяўленчага мастацтва, творы якога маюць фізічна-матэрыяльны, прадметны аб'ём і трохвымерную форму, размешчаную ў рэальнай прасторы. Вырабляецца з дрэва, каменю, гіпсу, косці, гліны, металу, пластмасы і інш. матэрыялаў. Найб. пашыраны аб'ект выявы — чалавек, радзей жывёлы (*анімалістычны жанр*), прырода (пейзаж), нацюрморт. У 20 ст. ўзнікла і распаўсюдзілася абстрактная С., для стварэння якой часта выкарыстоўваюць нетрадыц. матэрыялы (дрот, надзіманыя фігуры і інш.; гл. таксама *Кінетычнае мастацтва*). Гал. выразныя сродкі С. — пастаноўка фігуры ў прасторы, перадача яе руху, позы, жэста, святлоценявая мадэліроўка, якая ўзмацняе рэльефнасць формы, фактура лепкі або апрацоўка матэрыялу, архітэктанічная арганізацыя аб'ёму, зрокавы эфект яго масы, вагавых суадносін, выбар прапорцый. Аб'ёмная С. будуецца ў рэальнай прасторы па законах гармоніі, рытму, раўнавагі, узаемадзеяння з навакольным арх. ці прыродным асяроддзем і на аснове анатамічных або структурных асаблівасцей мадэлі. Асн. разнавіднасці С.: круглая С., што свабодна размяшчаецца ў прасторы (*статуя*, група, *торс*, *бюст*, статуэтка і інш.) і рэльефная, у якой аб'ёмныя выявы размяшчаюцца на плоскасці (*барэльеф*, *гарэльеф*, *контррэльеф*, паглыблены рэльеф). У залежнасці ад прызначэння

Да арт. **Скульптура.** Фараон Мікерын з жонкай. Егіпет. Каля 2,5 тыс. г. да н.э.

С. падзяляецца на станковую (гл. *Станковае мастацтва*), *манументальную скульптуру, манументальна-дэкаратыўную скульптуру, скульптуру малых форм*, надмагільную пластыку (гл. *Надмагілле*), *медальернае мастацтва, гліптыку* і інш. Тэхналогія яе стварэння ўключае лепку, разьбу, апрацоўку цвёрдых матэрыялаў, фармоўку, адліўку, чаканку, зварку і інш.

Раннія формы і віды С. існавалі ў многіх народаў свету з часоў *першабытнага мастацтва*. У неаліце С. (круглая, звычайна выявы невял. памераў) рэзалі з мяккіх парод каменю, косці, дрэва; схематычныя рэльефы выконвалі на каменных пласцінах і сценах пячор. Часта скульптурнымі выявамі ўпрыгожвалі прадметы побыту, прылады працы і паляванне; іх выкарыстоўвалі і ў якасці *амулетаў*. У рабаўладальніцкі перыяд С. выкрышталізавалася ў асобны від дзейнасці са спецыфічнымі задачамі (гл. ў арт. *Егіпет* Старажытны, *Шумер, Акад, Вавілонія, Асірыя, Скіфы*). Развітыя віды С. (гіганцкія выявы людзей і жывёл, рэльеф, партрэт) вядомы ў народаў Стараж. Усходу і Амерыкі. Адзін з найвыш. этапаў гісторыі С. — *антычнае мастацтва* (Лісіп, Міран, Фідый, Паліклет, Праксіцель, Скопас) з характэрнымі для яго ідэалам гарманічна развітога чалавека-грамадзяніна, з дасканалым уключэннем С. ў арх. ансамблі. Культавая С. сярэдневякоўя ў Еўропе і Азіі аб'ядноўвалася з архітэктурай у складаныя прасторавыя комплексы. У 2-й пал. 13 — пач. 14 ст. пачалі складвацца рысы *Адраджэння* (Н.Пізана і інш.). Увасабленне ідэалаў гуманізму Адраджэння ўласціва творчасці Данатэла, Якопа дэла Кверча, А.Верок'ё, Мікеланджэла (Італія), К.Слютэра (Бургундыя), Ж.Гужона, Ж.Пілона (Францыя), М.Пахера (Аўстрыя), А.Крафта, Ф.Штоса, Т.Рыменшнайдэра (Германія). Цікавасць да вырашэння дэкар. задач вылучае С. *маньерызму* (Б.Чэліні, Італія, і інш.). С. *барока* вызначаецца дынамічнымі формамі, імкненнем да ўрачыстасці і пышнасці: Л.Берніні (Італія), А.Шлютэр (Германія), П.Пюжэ (Францыя).

Да арт. Скульптура. Мікеланджэла. Хлопчык, які скурчыўся. Паміж 1520—34.

Да арт. Скульптура. Г.Мур. Фігура ляжыць. 1935.

Рысы барока і *класіцызму* развівалі Ф.Жырардон, А.Куазевокс (Францыя) і інш. У перыяд класіцызму побач з гіст., міфалагічнай і алегарычнымі тэмамі (А.Канова ў Італіі, Б.Торвальдсен у Данії) вял. значэнне набыў партрэт (Ж.Б.Пігаль, Э.М.Фальканэ, Ж.А.Гудон у Францыі). Пошукі новых выразных сродкаў, эмац. напружанасць уласцівы С. эпохі *рамантызму* (П.Ж.Давід д'Анжэ, А.Л.Бары, Ф.Руд у Францыі). У С. Расіі ў 18 ст. адбыўся пераход ад сярэдневяковых рэліг. форм да свецкага мастацтва (Б.К.Растрэлі і інш.). Пазней рас. С. развівалася ў рэчышчы агульнаеўрап. стыляў. Сярод прадстаўнікоў рус. акад. школы С. Ф.Шубін, М.Казлоўскі, Ф.Шчадрын, І.Мартас, В.Дэмут-Маліноўскі, С.Піменаў і інш. У 2-й пал. 19 ст. ў рас. і зах.-еўрап. С. класіцызму пераходзіць у *салоннае мастацтва*, якому процістаўляецца рэаліст. кірунак (гл. *Рэалізм*; Ж.Далу ў Францыі, К.Менье ў Бельгіі і інш.). У канцы 19 — пач. 20 ст. ў перыяд стылю *мадэрн* С. ствараецца як адзінае цэлае з інтэр'ерам, фасадам; складваюцца *імпрэсіянізм* (А.Радэн, Францыя), *сімвалізм*. Сярод найбуйнейшых скульптараў пач. 20 ст. А.Бурдэль, А.Маёль, Ш.Дэсп'ё (Францыя), Э.Барлах (Германія), І.Мештравіч (Харватыя), К.Брынкушы (Румынія). Розныя кірункі рас. С. ўвасоблены ў творах П.Трубяцкога, С.Канёнкава, А.Мацвеева, М.Андрэева і інш. Пластычная выразнасць форм набывае асн. значэнне ў С. М.Роса (Італія), А.Джакамеці (Швейцарыя), Г.Кольбе (Германія). Мадэрнісцкі эксперыменталізм 20 ст. прывёў да выкарыстання ў С. нетрадыц. матэрыялаў. У рэчышчы мадэрнізму працавалі Г.Арп, А.Архіпенка, Н.Габа, А.Колдэр, А.Пеўзнер, П.Пікасо. Сярод найбуйнейшых скульптараў 20 ст. Г.Мур (Вялікабрытанія), І.Ногучы (ЗША), К.Дунікоўскі (Польшча), Ф.Крэмер, О.Шлемер (Германія), Дж.Манцу (Італія), В.В.Аалтанен (Фінляндыя), С.Лебедзева, В.Мухіна, І.Шадр, Л.Шэрвуд, Я.Вучэціч, М.Анікушкін, А.Кібальнікаў, Э.Неізвесны, О.Цадкін (Расія), Ю.Мікенас, Г.Якубоніс (Літва).

Да арт. Скульптура. Венера Таўрычаская. Рымская копія. 3 ст. да н.э.

Да арт. Скульптура. Венера Вілендорфская. Аўстрыя. 30—25 тыс. г. да н.э.

Да арт. Скульптура. А.Глебаў. Ф.Скарына. 1954.

На тэр. Беларусі найб. раннія помнікі С. адносяцца да эпохі неаліту (гл. *Асавецкія творы першабытнага мастацтва, Багушэвіцкая статуэтка, Шклоўскі ідал*). У помніках С. часоў Кіеўскай Русі адметны ўплыў візант. мастацтва: каменныя разныя абразкі «Канстанцін і Алена» з Полацка, «Хрыстос Эмануіл» з Пінска (абодва 12 ст.), «Мікола і Стафан» і двухбаковы абраз «Пётр. Маці Божая» з Мінска (13 ст.), касцяны двухрадны абраз з Турава (15—16 ст.), абразок «Маці Божая Жыровіцкая» з яшмы (1470) і інш. У канцы 14—15 ст. у С. ўзмацніўся ўплыў зах.-еўрап. мастацтва. Цесная ўзаемасувязь з архітэктурай і яе маст. стылямі характэрна для культавай каменнай і драўлянай С. (гл. *Скульптура драўляная*). Традыцыі Адраджэння паўплывалі на мемарыяльную пластыку 16—17 ст.: надмагіллі М.К.Радзівіла ў Нясвіжскім касцёле езуітаў (17 ст.), сям'і П.Сапегі (пасля 1599 — пасля 1635). Своеасаблівасцю, высокім маст. узроўнем вызначаецца С. бел. барока: «Св. Себасцьян», «Св. Рох» з Навагрудка (пач. 17 ст.), С. алтароў Гродзенскага касцёла езуітаў (1736), Пінскага касцёла францысканцаў (18 ст.). У 2-й пал. 17 ст. шмат бел. майстроў працавала ў Рус. дзяржаве, дзе яны аздабляліі палацы і храмы (гл. *Беларуская рэзь*); вядомы паліхромныя маёлікавыя рэльефныя выявы апосталаў, выкананыя С.*Палубесам*. У 17—18 ст. узнікла свецкая С. (бюсты магнатаў, гіст. дзеячаў). З 2-й пал. 18 ст. С. набыла рысы *ракако*. Вобразы, створаныя ў гэты перыяд, захоўваюць манументальнасць, глыбіню і ўнутр. значнасць. Побач з дрэвам пашыраны С. са *стука*: канфесіянал і алтар са С. у касцёле бернардзінак у Слоніме (1751—64, лепшчык Я.Хедэль) і інш. У С. канца 18 ст. прыкметны ўплыў класіцызму; яны вылучаюцца ўрачыстасцю поз, спакойным рытмам аб'ёмаў: «Маці Божая» з в. Ганута Вілейскага р-на, стукавы дэкор у Свяцкім палацы (Гродзенскі р-н; мастакі Т.Манькоўскі, А.Смуглевіч), Верхнім замку ў Гродне, касцёле Ганны ў в. Мосар Глыбоцкага р-на і інш. Рысы позняга класіцызму ўласцівы творам К.Ельскага, А.Скірмунт, А.Ромера. У творчасці мастакоў канца 19 — пач. 20 ст. прыкметны рысы мадэрнізму: Я.Тышынскі, Я.Багушэўскі, К.Змігродскі, А.Краснапольскі, В.Бубноўскі. Рэалістычнасцю вызначаюцца партрэты сучаснікаў, выкананыя В.Смакоўскім, Р.Слізнем, керамічныя работы анімалістычнага жанру М.Міхалапа, творы К.Каганца, Я.Драздовіча. У 19 ст. пашыраны таксама палацава-паркавая, прыдарожная культавая і мемарыяльная С. (надмагіллі К.Радзівіл у Нясвіжскім касцёле езуітаў, 1825; А.Тызенгаўза ў Гродзенскім касцёле езуітаў, скульптар Т.Дыкас, 1887, і інш.). Пасля 1917 скульптары стваралі помнікі дзеячам рэв. руху. У 1920-х г. развіваўся пераважна станковы партрэт (творы А.Бразера, А.Грубэ). Пэўную ролю ў падрыхтоўцы кадраў адыграла скульптурнае аддзяленне Віцебскага маст. тэхнікума, выпускнікі якога ў пач. 1930-х г. удзельнічалі ў афармленні інтэр'ераў *Дома ўрада Рэспублікі Беларусь*. У 1953 адкрыўся маст. ф-т у Бел. тэатр.-маст. ін-це (цяпер Бел. АМ). У станковай С. стваралася партрэты дзярж. дзеячаў, дзеячаў мастацтва і культуры, у 1940—50-я г. — Герояў Сав. Саюза (З.Азгур, А.Бембель, Грубэ). У манум. С. вылучаюцца шматфігурныя рэльефы для *Манумента Перамогі* ў Мінску (Азгур, Бембель, А.Глебаў, С.Селіханаў). У 1960—70-я г. ставіліся помнікі партызанам, падпольшчыкам і воінам Сав. Арміі: патрыётам Асінторфа (Г.Мурамцаў), воінам і партызанам у калгасе «Бальшавік» Чэрвеньскага р-на (А.Анікейчык, Б.Івонцьеў); рэльефы на *Кургане Славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі*, у комплексах *Брэсцкая крэпасць-герой* (Бембель, А.Кібальнікаў), *Хатынь* (Селіханаў), *Манумент у гонар маці-патрыёткі* ў г. Жодзіна (А.Заспіцкі, І.Міско, М.Рыжанкоў). У

Да арт. Скульптура. А.Анікейчык. Г.Ахматава. 1982.

Да арт. Скульптура. А.Шатэрнік. Мікола Гусоўскі. 1984.

Да арт. Скульптура. А.Бачкароў. Феафан Грэк. 1988.

Да арт. Скульптура. А.Фінскі. Адчуванне палёту. 1997.

Да арт. Скульптура. А.Бембель. Барэльеф у Доме ўрада ў Мінску.

1970—2000 ствараліся *помнікі* і *мемарыяльныя дошкі, мемарыяльныя знакі, партрэты* вядучым дзеячам бел. культуры, навукі і мастацтва (Азгур, Анікейчык, Э.Астаф'еў, С.Вакар, С.Гарбунова, Глебаў, І.Голубеў, Л.Гумілеўскі, М.Інькоў, Міско, М.Якавенка, В.Янушкевіч і інш.). Развіваецца *садова-паркавая скульптура* (С.Гумілеўскі, Л.Давідзенка, У.Жбанаў, М.Канцавой, У.Слабодчыкаў). Пошукамі сучасных форм выяўлення, канцэптуальным падыходам да вырашэння ідэі, метафарычнасцю маст. мовы вылучаюцца творы І.Засімовіча, Т.Сакаловай, К.Селіханава, Слабодчыкава, А.Фінскага; выразнасцю і пластычнай завершанасцю — творы А.Арцімовіча, М.Байрачнага, А.Бачкарова, Г.Буралкіна, А.Дранца, Канцавога, П.Лука, В.Мурашова, А.Шатэрніка і інш. С. часта з'яўляецца састаўной часткай інсталяцый, маст. праектаў (С.Войчанка, У.Цэслер і інш.).

Літ.: Кацар М.С. Скульптура Савецкай Беларусі. Мн., 1957; Орлова М.А. Искусство Советской Белоруссии. М., 1960; Елатомцева И.М. Монументальная летопись эпохи. Мн., 1969; Яе ж. Очерки по истории белорусской советской станковой скульптуры. Мн., 1974; Леонова А.К. Народная деревянная скульптура Белоруссии. Мн., 1977; Петерсон Э.А. Портретная скульптура Советской Белоруссии. Мн., 1982; Пластыка Беларусі XII—XVIII стст.: [Альбом]. Мн., 1983; Высоцкая Н.Ф. Скульптура и резьба Беларуси XII—XVIII вв.: Каталог. Мн., 1998; Либман М.Я. О скульптуре. М., 1962; Шмидт И.М. Беседы о скульптуре. М., 1963; Валериус С.С. Прогрессивная скульптура XX в.: Пробл. и тенденции. М., 1973; Bazin G. The history of world sculpture. London, 1970.

А.К.Лявонава, Э.А.Петэрсон.

СКУЛЬПТУ́РА ДРАЎЛЯ́НАЯ. Вядома ў мастацтве многіх народаў з глыбокай старажытнасці. На тэр. Беларусі самыя раннія ўзоры вядомыя з эпохі неаліту (статуэтка мужчыны са стаянкі *Асавец*). З 14 ст. развівалася пераважна ў рэліг. мастацтве. С.д. размяшчалася ў касцёлах у алтарах храмаў і характарызавалася цеснай узаемасувяззю з архітэктурай і пануючымі маст. стылямі. З канца 14 — пач. 15 ст. ўзмацніліся зах.-еўрап. ўплывы. Рысы раманскага стылю ўласцівы «Укрыжаванню» з в. Галубічы Глыбоцкага р-на, выявам Міколы Мажайскага і Параскевы Пятніцы (16 ст.). Маст. каштоўнасцю вылучаецца разны абраз пінскага разьбяра *Ананія* «Премудрость созда себе храм. Праздники» (1459—1525). У познегатычных традыцыях выкананы алтарныя кампазіцыі 15 ст. «Марыя з дзіцем» (г.п. Рось Ваўкавыскага р-на, в. Новая Мыш Баранавіцкага р-на), выявы пач. 16 ст. Марыі і Іаана Багаслова (в. Мсцібава Ваўкавыскага р-на) з характэрнымі напружанымі позамі, парывістымі паваротамі, выцягнутымі прапорцыямі. Рысы позняй готыкі і Адраджэння прасочваюцца ў С.д. 16 — пач. 17 ст.: «Гжэгаж» (Полацк), Ганна і Іаакім (в. Здзітава Жабінкаўскага р-на). Уплывы рэнесансу праяўляюцца ў выбары тыпажу, індывідуалізацыі вобразаў, імкненні выявіць формы чалавечай фігуры: Кацярына, Лізавета (г.п. Шарашова Пружанскага р-на), Марыя з дзіцем (Нясвіж), алтарная скульптура касцёлаў у в. Будслаў Мядзельскага р-на і Воўпа Ваўкавыскага р-на (17 ст.). У С.д. праваслаўных храмаў была пашырана рэльефная разьба ў афармленні іканастасаў, царскіх варот. У 2-й пал. 17 ст. шмат бел. разьбяроў працавалі ў Расіі (гл. *Беларуская рэзьба*). Вядомы скульптуры «Укрыжаванне» і «Мікола Мажайскі», выкананыя старцам Іпалітам. Пад уплывам барока ў С.д. павысіліся эмацыянальнасць, пачуццёвасць, кантрасты маштабаў, святлоценявыя эфекты. Яна арганічна звязваецца з прасторавай кампазіцыяй інтэр'ера, утвараючы разам з інш. элементамі дэкору цэласны ансамбль (алтары касцёлаў і кляштараў езуітаў у Гродне, францысканцаў у Пінску, 18 ст.), асобныя скульптуры, што ўваходзілі ў алтарныя ансамблі (Пётр і Павел у в. Дварэц Дзятлаўскага р-на, Хрыстос ля слупа ў в. Сакалова Бярозаўскага р-на). З 2-й пал. 18 ст. С.д. набыла рысы ракако (выявы евангелістаў з в. Нягневічы Навагрудскага р-на, Іосіф з дзіцем з в. Правыя Масты Мастоўскага р-на і інш.). Творы канца 18—19 ст. з прыкметамі класіцызму вылучаюцца ўрачыстасцю поз, спакойным рытмам аб'ёмаў (Маці Божая з в. Ганута Вілейскага р-на і інш.). У нар. С.д. гэтага перыяду таксама панавала рэліг. тэматыка. Зробленыя нар. майстрамі выявы святых ставілі ў невял. храмах, капліцах, на крыжах, мемарыяльных слупах і інш. Своеасаблівасць пласт. мовы нар. С.д. — статычнасць, франтальнасць поз, выразнасць сілуэта, непрапарцыянальная ўзбуйненасць галавы і рук, паліхромная размалёўка, у якой пераважалі насычаныя чырвоны, сіні, белы, зя-

Да арт. Скульптура драўляная. Невядомы мастак. Разныя царскія вароты. 16 ст.

Да арт. Скульптура драўляная. Пётр. Вёска Нягневічы Навагрудскага раёна Гродзенскай вобл. Сярэдзіна 18 ст.

лёны колеры. Вобразы святых вызначаюцца жыццёвасцю, непасрэднасцю і шчырасцю пачуццяў: выявы архістратэга Міхаіла, Ядвігі, Іосіфа з дзіцем з в. Забалаць Воранаўскага р-на, «Укрыжаванне» з Брэстчыны і інш. Сярод найб. вядомых разьбяроў 18—19 ст. І.Астапчык, Булоўскі, І.Гарбацэвіч, А.Занеўскі, А.Івашкевіч, Каліноўскі, А.Малышэвіч, В.Пікулік, П.Якавіцкі.

У 1930—50-я г. ў самадзейнай творчасці сярод вобразаў пераважалі дзярж. і паліт. дзеячы, сюжэтныя кампазіцыі на тэмы працы і ваен. падзей. Сярод майстроў С.д. — М.Астроўскі, А.Бялоў, С.Бык, С.Вольскі, М.Івінскі, У.Мацюк, Г.Паварыч і інш. Уплыў нар. мастацтва, лаканізм, унутр. напружанасць вылучаюць творы прафес. скульптара А.Грубэ. У 1970—90-я г. самадзейныя майстры (Г.Асіпкова, Б.Васількоў, А.Міхеенка, А.Пупка, С.Шаўроў) побач з сюжэтна-тэматычнымі і партрэтнымі кампазіцыямі працавалі ў пластыцы малых форм (гл. *Скульптура малых форм*), звярталіся да анімалістычнага, быт. і гіст. жанраў, багатай фалькл. і культ. спадчыны. Традыцыі нар. С.д. працягвалі П.Зяляўскі (культавая скульптура), Ф.Максімаў (сатыр. кампазіцыі, работы на тэмы нар. казак, легенд і інш.), М.Рышкевіч (быт. тэматыка), І.Супрунчык (кампазіцыі на тэмы нар. свят, сельскага побыту, вобразы дзеячаў бел. гісторыі). Прафес. скульптары шмат увагі аддаюць стварэнню партрэтных вобразаў герояў Вял. Айч. вайны, гіст., культ., грамадскіх і паліт. дзеячаў (С.Вакар, А.Глебаў, Л.Гумілеўскі, Г.Мурамцаў). Пратэст супраць вайны і гераізм народа ў творах А.Бачкарова, Л.Давідзенкі, Л.Зільбера, У.Церабуна. У пошуках эмацыянальна напоўненай выразнай формы скульптары выкарыстоўваюць сімвалы і алегорыі (Г.Буралкін, Г.Гаравая, У.Слабодчыкаў, А.Фінскі і інш.). Самадзейныя скульптары ўдзельнічаюць у стварэнні мемарыяльных помнікаў-комплексаў: «Коласаўскі шлях» (1991; скульптары У.Балдоўскі, У.Ганчарук, Т.Дзялендзік, М.Корабаў, М.Скляр, Супрунчык), святах-конкурсах («Дрэва жыцця» ў г.п. Мір Карэліцкага р-на, 1999; В.Казлоў, А.Маголін, А.Пагажэльскі, В.Пятровіч, В.Сілкоў, Скляр, У.Яленскі).

Літ.: Леонова А.К. Народная деревянная скульптура Белоруссии. Мн., 1977; Высоцкая Н.Ф. Скульптура и резьба Беларуси XII—XVIII вв.: Каталог. Мн., 1998.

А.К.Лявонава.

СКУЛЬПТУ́РА МАЛЫ́Х ФО́РМ, дробная пластыка, скульптурныя творы невял. памераў, якія выконваюць пераважна дэкаратыўныя (часам рытуальныя) функцыі; разнавіднасць *скульптуры*. Пашырана ў *дэкаратыўна-прыкладным мастацтве*. Вырабляецца таксама *мастацкай прамысловасцю* і нар.-маст. промысламі з керамікі, металу, косці, каменю, шкла, пластмасы і інш. Да С.м.ф. належаць жанравыя статуэткі, настольныя партрэтныя выявы, разнастайныя віды цацак, а таксама манеты, медалі, гемы. Творы дробнай пластыкі выкарыстоўваюць у стварэнні пэўнага эстэт.-эмацыянальнага асяроддзя, вызначаюцца выразнасцю кампазіцыйных вырашэнняў, выяўленнем пластычных і дэкар. магчымасцей матэрыялу. С.м.ф. зарадзілася ў эпоху палеаліту і звязана з вераваннямі і працоўнай дзейнасцю (знаходкі ў пячоры Мас-д'Азіль у Францыі, Вілендорф у Аўстрыі, Мальце і Бурэце ў Сібіры і інш.). На тэр. Беларусі вядома з эпохі неаліту: касцяныя і драўляныя фігуркі людзей, качак, коней са стаянак Крывіна (гл. *Галоўск*), *Асавец*. Да жал. веку адносяцца гліняныя фігуркі жывёл *мілаградскай культуры* з гарадзішчаў Гарошкаў, Мохаў. З прыняццем хрысціянства вял. пашырэнне ў 11—13 ст. набылі каменныя і касцяныя абразкі з рэльефнымі выявамі святых. Узоры быт. пластыкі вядомы з 12—13 ст. С.м.ф. 14—16 ст. характарызуецца цеснай сувяззю з маст. ліццём (крыжы і абразкі, знойдзеныя ў Магілёве, Мінску і інш.). З 16—17 ст. пашырана *медальернае мастацтва*, развіццю якога спрыяла дзейнасць *Віленскага манетнага двара*. У 19 — пач. 20 ст. рысамі стылю мадэрн вызначаліся керамічныя статуэткі і дэкар. вазы В. *Бубноўскага*. У анімалістычным жанры працаваў жывапісец Г.*Вейсенгоф*, у рэаліст. манеры выкананы партрэты-барэльефы Я.*Драздовіча* (Я.Пачопкі, М.Машары, А.Грыневіча і інш.), амаль ва ўсіх цэнтрах ганчарства выраблялі гліняныя цацкі (майстры В. і П. Ланеўскія, І.Данілевіч), у многіх — дэкар. пасудзіны (майстры В.Кузьміцкі, Ф.Дзудзакевіч, А.Петрашкевіч, Я.Ступкевіч). Мела пашырэнне драўляная цацка. У 1940-я г. нац. каларытам вылучаліся работы М. Філіповіча. У 2-й пал. 20 ст. ствараецца сюжэтная пластыка ў фарфоры, шамоце, гліне (мастакі У.Андрыянаў, М.Бяляеў, Г.Гаркуноў, М.*Звярко*). У анімалістычным жанры працавалі Л.*Багданаў*, Ф.*Зільберт*, Т.Мацвеенка, Т.*Паражняк*. Багаццем пластычных вырашэнняў вылучаецца гутная пластыка нар. майстроў Р.Багінскага, Г.Лінкевіча,



Да арт. Скульптура драўляная. Іосіф. Скульптура алтара касцёла ў в. Будслаў Мядзельскага раёна Мінскай вобл. 1633—44.

Да арт. Скульптура драўляная. П.Зяляўскі. Маці Божая. 1980—90-я г.



Да арт. Скульптура драўляная. У.Слабодчыкаў. Спелыя яблыкі. 1980.

Да арт. **Скульптура малых форм**. М.Звярко. Кампазіцыя «Івянецкія ганчары».

Да арт. Скульптура малых форм. Птушачка. Бронза. Ліццё.

Да арт. Скульптура прыдарожная. Капліца на ўскраіне вёскі Квяткоўцы Іўеўскага раёна Гродзенскай вобл.

С.Раўдвеэ. У традыцыях нар. глінянай скульптуры працуе М.*Пушкар*. Своеасаблівыя дэкар. пласты, плакеткі, сувенірныя медалі ствараюць М.*Байрачны*, А.*Зіменка*, Л.Талбузін. У керамічы працуюць М.Балюк, Т.*Васюк*, М.*Кляцкоў*, А.*Концуб*, У.Церабун і інш. С.м.ф. стала вядучай у творчасці самадз. майстроў-разьбяроў А.*Міхеенкі* (Полацк), А.*Пупко* (Івянец), В.Альшэўскага і М.Ерафеева (Мінск), Г.Асіпковай (Чашнікі), Б.Васількова (Гомель), С.Жыголкіна (Віцебск), С.Шаўрова (Орша). Гл. таксама *Скульптура драўляная*.

Літ.: Жук В.И. Современная белорусская керамика. Мн., 1984; Леонова А.К. Народная деревянная скульптура Белоруссии. Мн., 1977. *А.К.Лявонава.*

СКУЛЬПТУ́РА ПРЫДАРО́ЖНАЯ, розныя паводле характару і прызначэння збудаванні ці інш. аб'екты, якія ставяцца ўздоўж дарог і спалучаюць рысы *скульптуры* і *архітэктуры малых форм*; жанр *манументальнага мастацтва*. С.п. рэліг. і мемар. характару вядома здаўна ў многіх краінах свету (слупы са скульптурамі ў Індыі, скульптуры багоў і герояў у Стараж. Грэцыі). У выніку хрысціянізацыі ў Еўропе, у т.л. на ўсх.-слав. землях, вял. пашырэнне атрымалі прыдарожныя крыжы і каплічкі. На Беларусі С.п. вядома ад язычніцкіх часоў, склалася як духоўная традыцыя бел. народа. Лаўрэнцьеўскі летапіс (14 ст.) упамінае пра звычай у радзімічаў і крывічоў пахавання каля дарог, які быў звязаны з міфалагічнымі вераваннямі ў апошні адыход і абароннае значэнне праху продкаў. Пасля хрысціянізацыі і асабліва ў перыяд сярэдневякоўя пашырылася буд-ва прыдарожных крыжоў і каплічак са скульпт. выявамі. Яны прызначаліся найперш для пакланення, а таксама мелі знакава-інфарм. значэнне. Ставілі іх звычайна на скрыжаваннях, раздарожжах ці на ўездах у населены пункт. У кампазіцыю ўключалі скульпт. выявы Хрыста, Дзевы Марыі, святых. Аздабленне адметнае высокім узроўнем разьбы па дрэве, коўкі металу. У ваен. часы ўздоўж дарог будавалі помнікі, якія нагадвалі пра гіст. падзеі і якім пакланяліся (*Мілавідская мемарыяльная капліца*, *Салтанаўская мемарыяльная капліца*). Пасля Вял. Айч. вайны каля дарог пастаўлена вял. колькасць помнікаў, мемар. комплексаў, звязаных з брацкімі пахаваннямі і ваен. дзеяннямі, якія тут вяліся (*Курган Славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі, Рыленкі*); яны ўключаюць у свае кампазіцыі элементы С.п. З 1960-х г. распаўсюдзіліся сімвалічныя манум.-дэкар. збудаванні на межах краіны, абласцей, раёнаў, гарадоў, у афармленні якіх выкарыстоўваюцца элементы старых гербаў, новая геральдыка. Архітэктура малых форм уздоўж аўтамаб. дарог прадстаўлена рознымі аб'ектамі добраўпарадкавання (аўтобусныя павільёны, навесы, альтанкі, кветнікі, паказальнікі і інш.). У іх аздабленні выкарыстоўваюцца фалькл. матывы дэкар. мастацтва і нар. дойлідства (прыдарожны знак каля павароту на ўрочышча Бервянец па дарозе Стоўбцы—Мікалаеўшчына, паказальнік у Купалаўскім мемар. запаведніку «Вязынка» і інш.). *А.С.Сардараў.*

Да арт. Скульптура прыдарожная. Крыж у Нясвіжскім раёне Мінскай вобл. Пач. 20 ст.

СКУ́МБРЫЯ, звычайная, макрэль (Scomber scombrus), рыба сям. скумбрыевых атр. акунепадобных. Па-

Скумбрыя звычайная.

шырана ў паўн. ч. Атлантычнага ак.: каля берагоў Паўн. Амерыкі — ад Лабрадора да Караліны; Еўропы — ад Канарскіх а-воў да Ісландыі, у Міжземным, Мармуровым, Чорным, Паўночным, Балтыйскім морах. Блізкія віды — японская С. (S. japonicus) — пашырана каля зах. і ўсх. узбярэжжаў Ціхага ак., у т.л. ў Японскім м.; каля Паўд. Афрыкі; каля зах. і ўсх. берагоў Атлант. ак., у т.л. ў Міжземным і Чорным м.; аўстралійская С. (S. australasicus) — каля Паўд. Аўстраліі і Новай Зеландыі; канагурта (Rastrelliger kanagurta) — каля берагоў Усх. Афрыкі, Паўд. Азіі, Паўн. Аўстраліі і ў прыастраўных водах — ад в-ва Мадагаскар і Чырвонага м. да а-воў Палінезіі; блізкая да канагурты індыйская С. (R. brachysoma) — каля берагоў Інданезіі, Індыі, Малайзіі, М'янмы, Пакістана, Тайланда, Шры-Ланкі; філіпінская С. (R. faughni) — каля берагоў Філіпін.

Даўж. да 60 см, маса да 1,6 кг. Цела верацёнападобнае. Спіна сінявата-зялёная са шматлікімі чорнымі выгнутымі палоскамі. Вясной робіць нераставыя і кармавыя міграцыі. Корміцца планктонам. Аб'ект промыслу. *Л.В.Кірыленка.*

СКУ́МПІЯ (Cotinus), род кветкавых раслін сям. сумахавых (анакардыевых). 3 віды. Пашыраны ў Паўн. Амерыцы, Паўд. Еўропе і Паўд. Азіі. Трапляюцца на сухіх камяністых схілах, сярод хмызняку, радзей у хваёвых і дубовых лясах. На Беларусі інтрадукавана С. звычайная, або кагігрыя, ці парыковае дрэва (C. coggygria).

Лістападныя кусты або невял. дрэвы выш. 5—10 м з шара- ці парасонападобнай кронай. Лісце чаргаванае, простае, суцэльнае. Кветкі дробныя, жаўтавата-белыя або зеленаватыя ў рыхлых канцавых мяцёлках даўж. да 30 см. Плод — сухая касцянка. Дэкар., меданосныя, фарбавальныя, дубільныя расліны. *А.М.Скуратовіч.*

СКУ́НСЫ, смярдзючкі (Mephitinae), падсямейства млекакормячых сям. куніцавых атр. драпежных. 3 роды: С. паласатыя (Mephitis), 2 віды; С. плямістыя (Spilogale), 2 віды; С. свінаносыя (Conepatus), 6—7 відаў. Пашыраны ў Паўн. і Цэнтр. Амерыцы. Жывуць у розных біятопах, ад лясоў да пустынь. У паўн. ч. арэала зімой упадаюць у спячку.

Даўж. цела да 49 см, хваста да 44 см, маса да 4,5 кг. Сакрэт анальных залоз з агіднym стойкім смуродам (адпужвае ворагаў) — адсюль другая назва. Кормяцца пладамі, ягадамі, насякомымі, птушкамі, дробнымі млекакормячымі. Палігамы; нараджаюць да 10 (звычайна 5—6) дзіцянят за год. С. паласатыя (M. mephitis) — аб'ект пушнога промыслу і развядзення. *Э.Р.Самусенка.*

СКУ́ПА (Skupa) Іосеф (16.1.1892, г. Страканіцы, Чэхія — 8.1.1957), чэхаславацкі тэатр. дзеяч, акцёр, рэжысёр, мастак тэатра лялек. Нар. арт. Чэхаславакіі (1948). З 1916 мастак, лялькавод у Пльзенскім марыянетачным тэатры. У 1930 арганізаваў у Пльзене «Тэатр Спейбла і Гурвінека», гал. героі якога зроблены паводле эскізаў С. З 1945 выступаў у Празе. У 1933—57 прэзідэнт Міжнар. саюза лялечнікаў. Дзярж. прэмія Чэхаславакіі 1955.

Скумпія звычайная.

Скунсы: 1 — паласаты; 2 — плямісты; 3 — свінаносы.

СКУ́ПШЧЫК, прадстаўнік гандл. капіталу, які займаўся скупкай у вытворцаў або перакупкай у контрагентаў вырабаў гарадскіх і дробных сял. промыслаў, прадуктаў сял. і памешчыцкай гаспадаркі для іх перапродажу. Найб. вядомы ў 17 — 1-й пал. 19 ст., калі развіццё тавarнага абароту паглыбілася, а сам вытворца тавараў не меў часу гандляваць на рынку. На мануфактурнай стадыі развіцця прам-сці роля С. паменшала, бо С. часта сам станавіўся гаспадаром мануфактуры. На Беларусі функцыі С. выконвалі таксама прасолы, булыні, самавозы-гандляры, «ліцвінкі», шынкары, карчмары. Скупка тавараў з мэтаю перапродажу была адной з крыніц фарміравання купецкіх капіталаў. *В.В.Швед.*

СКУ́РА, вонкавае покрыва цела чалавека і жывёл; ахоўны бар'ер паміж навакольным асяроддзем і арганізмам. Ахоўвае цела ад мех. уздзеянняў і траўмаў, пранікнення розных рэчываў і мікраарганізмаў, удзельнічае ў пачуцці дотыку, дыханні, абмене рэчываў, напр., воднасалявым (за суткі выдзяляе да 500 мл вады), сінтэзе вітамінаў, выдзяленні, тэрмарэгуляцыі (82% цеплавых страт), сакрэцыі і экскрэцыі, дэпаніраванні крыві. Вытворныя скуры: валасы, потавыя, сальныя, малочныя залозы, пазногці, кіпцюры, пер'е, капыты і інш.

Мае 3 слаі: эпідэрміс (паверхневы слой, шматслойны эпітэлій), дэрму (уласна С., сярэдні злучальнатканкавы слой, багаты сасудамі і нервамі) і гіпадэрму (глыбокі слой, падскурная тлушчавая клятчатка). Афарбоўка С. абумоўлена пігментнымі клеткамі. Пра паталаг. змены С. гл. *Дэрматозы, Дэрматыт.*

Літ.: Калантаевская К.А. Морфология и физиология кожи человека. 2 изд. Киев. 1972; Кожа: (Строение, функция, общая патология и терапия). М., 1982. *А.С.Леанцюк.*

СКУ́РА ШТУ́ЧНАЯ, матэрыял прамысл. вытв-сці, які выкарыстоўваюць як заменнік натуральнай скуры. Паводле характару вытв-сці, тыпу матэрыялаў і вырабаў адрозніваюць С.ш. мяккія, цвёрдыя (тыпу кардону) і сінт. падэшвенныя матэрыялы; класіфікуюць таксама паводле прызначэння (абутковыя, адзежныя, галантарэйныя, дэкаратыўна-гаспадарчыя, тэхн. і інш.).

Мяккія С.ш. — пераважна многаслойныя рулонныя матэрыялы, якія маюць валакністую аснову (тканіна, трыкатаж, *нятканыя матэрыялы* і інш.) з нанесеным на яе палімерным (каўчукавым, поліамідным, полівінілхларыдным, нітрацэлюлозным і інш.) ці сумешчаным (з сумесі асобных палімераў) пакрыццём. У абутковай прам-сці для вырабу верху *абутку* шырока выкарыстоўваюць сінтэтычную скуру — С.ш. на нятканай аснове з порыстым вонкавым поліэфірурэтанавым пакрыццём, якая знешнім выглядам і ўласцівасцямі падобная на мяккую вырабленую скуру. Мяккія С.ш. выкарыстоўваюць таксама ў швейнай, скургалантарэйнай, паліграф. прам-сці. Цвёрдыя С.ш. — адна- ці многаслойныя ліставыя матэрыялы, якія вырабляюць праклеваннем суспензіі скураных і раслінных валокнаў (размолатыя адходы гарбарнай, абутковай, швейнай вытв-сці, утылю) пераважна *латэксамі сінтэтычнымі* з наступнай апрацоўкай паводле тэхналогіі, блізкай да тэхналогіі вытв-сці

паперы і кардону. Моцныя, устойлівыя да сцірання, захоўваюць фіз.-мех. ўласцівасці ў намочаным стане. Выкарыстоўваюць для вырабу ўнутр. (вусцілкі, заднікі) дэталей абутку, дарожных сумак і чамаданаў. Сінтэтычныя падэшвенныя матэрыялы выкарыстоўваюць для вырабу падэшваў, падноскаў, абцасаў, набоек. Да іх адносяць падэшвенную *гуму* — фармаваныя і штампаваныя дэталі і пласціны порыстыя (гл. *Сітаватая гума*) і маналітныя, а таксама фармаваныя дэталі з пенаполіурэтанаў і падэшвы з *тэрмапластаў* і тэрмаэластапластаў. Гл. таксама *Гарбарная прамысловасць*.

СКУРАЕ́ДЫ (Dermestidae), сямейства жукоў падатр. разнаедных. Каля 900 відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя Антарктыды, пераважна ў сухіх раёнах. Пасяляюцца на трупах жывёл, у гнёздах птушак, насякомых, норах грызуноў, пад карой дрэў, на жывёльнай сыравіне (скура, шэрсць, футра і вырабы з іх, вяленае мяса і рыба) і інш. На Беларусі 20—30 відаў, сярод іх С.: вяндлінны (Dermestes lardarius), дывановы (Attagenus pissus), залознікавы (Anthrenus scrophulariae), музейны (Anthrenus museorum) і інш.

Даўж. 1,3—12 мм. Цела звычайна авальнае, пакрытае валаскамі або лускавінкамі. Афарбоўка цёмна-карычневая або чорная, часта са стракатым малюнкам. Кормяцца сухімі рэчывамі жывёльнага і расл. паходжання, некат. — пылком кветак. У прыродных умовах — санітары, каля жылля чалавека — шкоднікі.

СКУРА́НКА, род кветкавых раслін, тое, што *птэлея*.

СКУРА́ТАЎ-БЕ́ЛЬСКІ Рыгор Лук'янавіч (Малюта; ? — 1.1.1573), адзін з кіраўнікоў *апрычніны* Івана IV Грознага у Рас. дзяржаве 16 ст., актыўны арганізатар апрычнага тэрору. Набыў вядомасць і ўплыў у 1569, калі ўдзельнічаў у следстве над стрыечным братам Івана IV кн. У.А.Старыцкім і ў яго смяротным пакаранні. У снеж. 1569 задушыў б. мітрапаліта Піліпа Колычава, у студз. 1570 кіраваў разгромам Ноўгарада, дзе забіў тысячы жыхароў. У 1571 вёў следства аб прычынах паражэння рус. войск у баі з ардой крымскага хана Дэўлет-Гірэя. Загінуў у баі ў час *Лівонскай вайны*. З яго імем гіст. традыцыя звязвае жорсткасці, забойствы і смяротныя пакаранні часоў Івана IV.

СКУРАТО́ВІЧ (Skuratowicz) Пётр (1.8.1891, в. Вялікія Філіпкавічы Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. — крас. 1940), польскі ваенны дзеяч. Ген. брыгады Войска Польскага (1939). Скончыў кадэцкі корпус у Полацку (1909), вучыўся ў кав. школе ў Елізаветградзе (цяпер Кіраваград, Украіна; 1909—11). З 1917 у 1-м польскім корпусе ген. Ю.Р.*Доўбар-Мусніцкага*, з 1918 у Войску Польскім. Камандаваў шэрагам польскіх кав. злучэнняў, у т.л. Цэнтрам навучання кавалерыі ў г. Грудзёнз. У 1939 інтэрніраваны сав. войскамі. Загінуў у лагеры для ваеннапалонных.

Ю.В.Грыбоўскі.

СКУ́РКА, гл. ў арт. *Эпідэрміс*.

СКУРКО́ Віталь Васілевіч (23.9.1933, в. Ойценава Валожынскага р-на Мінскай вобл. — 12.5.2000), бел. вучоны ў галіне механікі і педагог. Канд. тэхн. н. (1968), праф. (1993). Скончыў БПІ (1956). У 1956—73 на інж.-тэхн. і н.-д. рабоце ў АН Беларусі і ін-це «Белдзіпраторф». З 1973 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі (у 1975—2000 заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях механізацыі здабычы торфу, праблемах выкладання нарысоўнай геаметрыі і інж. графікі ў ВНУ радыёэлектроннага профілю.

Тв.: Инженерная графика: Элементы машинной графики. Ч. 1. Мн., 1991 (у сааўт.); Злучэнні дэталей у прыборах РЭА і ЭВА: Альбом вучэб. чарцяжоў. Мн., 1996 (у сааўт.).

А.І.Болсун.

СКУРКО́ Іосіф Уладзіміравіч (24.2.1938, в. Пількаўшчына Мядзельскага р-на Мінскай вобл. — 2.7.1989), бел. паэт, кінадраматург, перакладчык. Скончыў БДУ (1965). Працаваў у ЦК ЛКСМБ, у Бюро міжнар. маладзёжнага турызму «Спадарожнік», у апараце СМ Беларусі. У 1974—89 на Бел. тэлебачанні. Друкаваўся з 1962. Аўтар зб. лірыкі «Бацькоўскі парог» (1973). Вершы С. вылучаюцца мілагучнасцю і меладычнасцю, прасякнуты грамадз. пафасам, любоўю да роднага краю; на многія з іх напісаны песні. Напісаў сцэнарый дакумент. фільма «Драўгістэ — дружба». На бел. мову пераклаў паасобныя творы В.Бокава, Б.Кежуна, А.Твардоўскага, К.Шавялёвай, М.Нагнібеды, К.Галчынскага і інш.

Тв.: Весніцы: Вершы, песні. Мн., 1990.

Літ.: Лойка А. Паэзія і час. Мн., 1981.

І.У.Саламевіч.

СКУ́РНЫЯ ХВАРО́БЫ, тое, што *дэрматозы*.

СКУРЫСТАКРЫ́ЛЫЯ, вухавёрткі (Dermaptera), атрад насякомых. Каля 1300 відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў тропіках і субтропіках. Вядомы з пермскага перыяду. Вільгаце- і цеплалюбівыя. Актыўныя пераважна ноччу. На Беларусі найб. трапляюцца вухавёрткі: агародная (Forficula tomis) і звычайная (F. auricularia).

Даўж. 3,5—50 мм. Цела прадаўгаватае, цёмнае, з 2 клешчападобнымі прыдаткамі на канцы брушка. Ротавы апарат грызучы. Пярэднія крылы цвёрдыя, укарочаныя, заднія шырокія, перапончатыя, часта адсутнічаюць. Ператварэнне няпоўнае. Кормяцца жывёльнымі і расл. рэшткамі. Некат. шкодзяць с.-г. культурам.

СКУ́ТЭР (англ. scooter ад scoot імчацца), аднамеснае гоначнае судна з падвесным маторам адвольнай канструкцыі, але з поршневым рухавіком і без наддуву. Мае ў плане форму трох- ці чатырохвугольніка, днішча плоскае з рэданам (уступ для стварэння пад'ёмнай сілы, пад уздзеяннем якой судна пачынае слізгацець па паверхні вады — глісіраваць). Тэрмін «С.» быў прыняты толькі ў СССР; з'явіўся ў 1928 пасля пабудовы моталодкі па замежным праекце, што меў назву «Scooter».

СКЭБ (ад англ. scab кароста), лаянкавае прозвішча *штрэйкбрэхераў* у Англіі, ЗША.

СКЮДЭРЫ́ (Scudéry, Scudéri) Мадлен дэ (15.10.1607, г. Гаўр, Францыя — 2.6.1701), французская пісьменніца; прадстаўніца *прэцыёзнай літаратуры*. З 1630 у Парыжы, дзе заснавала арыстакратычны літ. салон, які стаў цэнтрам прэцыёзнага руху. Аўтар галантна-гераічных раманаў «Ібрагім, або Вялікі паша» (1641), «Артамен, або Вялікі Кір» (т. 1—10, 1649—53), «Клелія, або Рымская гісторыя» (т. 1—10, 1654—61), баек, вершаў і інш., у цэнтры якіх кодэкс прэцыёзнай маралі, вытанчанага густу, галантных пачуццяў і паводзін. Яе творы адзначаны майстэрствам сюжэтапабудовы, маляўнічасцю стылю, рысамі псіхалагізму і дыдактызму.

Літ.: Гончар М.О. Концепция романа у М. де Скюдери // XVII век в диалоге эпох и культур. СПб., 2000.

Г.В.Сініла.

СЛАБАДА́, радовішча жвірова-пясчанага матэрыялу ў Лагойскім р-не Мінскай вобл., каля в. Слабада. Пластавы паклад звязаны з канцова-марэннымі адкладамі сожскага ледавіка. Жвірова-пясчаны матэрыял шаравата-жоўты, з лінзамі і гнёздамі ажалязнення, месцамі гліністы, з праслоямі супеску і пяску, кандыцыйнага жвіру (буйнейшага за 5 мм) 24,3%, трапляюцца галька і валуны. Пясок у сумесі розназярністы, палевашпатава-кварцавы. Разведаныя запасы 31,9 млн. м^3, перспектыўныя 122,3 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 5—33,5 м, ускрышы (пяскі, супескі) 0,1—8,2 м. Жвірова-пясчаны матэрыял прыдатны на выраб бетону, буд. раствораў, у дарожным буд-ве.

А.П.Шчураў.

СЛАБАДА́, тып сельскага паселішча. Назва звязана з тым, што ў перыяд феадалізму жыхары С. карысталіся часовым вызваленнем ад падаткаў. У зах. рэгіёнах Беларусі (асабліва ў Пінскім Палессі) такія пасяленні наз. Волямі, Вулькамі. Такія назвы атрымлівалі паселішчы, жыхары якіх вызваляліся (станавіліся вольнымі) на тэрмін ад 2 да 12 гадоў ад чыншу і павіннасцей з прычыны неўрадлівасці зямель, якія яны на інш. умовах адмаўляліся апрацоўваць. Такая сістэма асабліва пашырылася пасля Паўночнай вайны 1700—21. Пазней С. сталі называць невял. пасёлкі гар. тыпу каля павятовых гарадоў, дзе жылі рамеснікі, што пакінулі абшчыну і толькі часткова былі звязаны з сельскай гаспадаркай. Пад уплывам розных сац.-эканам. і паліт. прычын С. зліліся з гарадамі або трансфармаваліся ў звычайныя сельскія паселішчы і сталі назвамі вёсак (напр., Слабада ў Мінскім р-не) або часткамі назвы вёсак (напр., Чырвоная Слабада ў Салігорскім р-не).

СЛАБАДА́, вёска ў Халопеніцкім пас. Савеце Крупскага р-на Мінскай вобл., каля р. Эса. Цэнтр эксперым. базы

«Эса». За 40 км на Пн ад горада і 34 км ад чыг. ст. Крупкі, 145 км ад Мінска. 575 ж., 215 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЛАБАДА́, вёска ў Тонежскім с/с Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр камунальнага с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 52 км на ПнЗ ад г.п. Лельчыцы, 259 км ад Гомеля, 71 км ад чыг. ст. Жыткавічы. 592 ж., 257 двароў (2001). Лясніцтва, вытв. ўчастак па зборы жывіцы акц. т-ва «Лесахімік». Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

СЛАБАДА́, вёска ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 14 км на Пд ад горада і чыг. ст. Лепель, 129 км ад Віцебска. 560 ж., 192 двары (2001). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, камбінат. быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЛАБАДА́, вёска ў Мазырскім р-не Гомельскай вобл., каля аўтадарогі Мазыр—Петрыкаў. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 19 км на З ад горада і чыг. ст. Мазыр, 152 км ад Гомеля. 952 ж., 428 двароў (2001). Лясніцтва, дрэваапр. цэх. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі. Брацкія магілы чырвонаармейцаў, якія загінулі ў 1918—20, сав. воінаў і партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі курганныя могільнікі (9—11 ст.).

СЛАБАДА́, вёска ў Даўгінаўскім с/с Міёрскага р-на Віцебскай вобл., на левым беразе р. Зах. Дзвіна, каля аўтадарогі Міёры—Верхнядзвінск. Цэнтр калгаса. За 30 км на ПнУ ад г. Міёры, 176 км ад Віцебска, 4 км ад чыг. ст. Верхнядзвінск. 385 ж., 176 двароў (2001). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЛАБАДА́, вёска ў Мядзельскім р-не Мінскай вобл., каля аўтадарогі Мядзел—Ваўкалаты. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 21 км на ПнУ ад г. Мядзел, 161 км ад Мінска, 23 км ад чыг. ст. Варапаева. 244 ж., 90 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — Свята-Аляксандра-Неўская царква (1880).

СЛАБАДА́, вёска ў Смалявіцкім р-не Мінскай вобл., каля аўтадарогі Мінск—Барысаў. Цэнтр Азярыцка-Слабадскога с/с і калгаса. За 12 км на З ад г. Смалявічы, 25 км ад Мінска, 4 км ад чыг. ст. Слабада. 1729 ж., 594 двары (2001). Сярэдняя і муз. школы, клуб, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Свята-Пакроўская царква. Брацкая магіла сав. воінаў. За 500 м на Пн ад вёскі *Курган Славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі.*

СЛАБАДА́, вёска ў Сарочынскім с/с Ушацкага р-на Віцебскай вобл., на зах. беразе воз. Чарсцвяцкае. Цэнтр калгаса. За 15 км на У ад г.п. Ушачы, 140 км ад Віцебска, 40 км ад чыг. ст. Полацк. 254 ж., 105 двароў (2001). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЛАБАДА́-КУ́ЧЫНКА, вёска ў Капыльскім р-не Мінскай вобл., на р. Выня, каля аўтадарогі Асіповічы—Нясвіж. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 14 км на ПнУ ад г. Капыль, 108 км ад Мінска, 24 км ад чыг. ст. Цімкавічы. 502 ж., 193 двары (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЛАБАДЗЯНЮ́К (дзявочае З у б а в а) Вера Міхайлаўна (н. 22.6.1938, г. Курск, Расія), бел. спартсменка і трэнер (парашутны спорт). Майстар спорту СССР (1959). Засл. трэнер Беларусі (1976). З 1976 інструктар-парашутыст Мінскага аэраклуба. Чэмпіёнка свету па паветранай акрабатыцы, сярэбраны прызёр у мнагабор'і і ў асабістым заліку (1960, Сафія). Абс. чэмпіёнка Усесаюзнай спартакіяды па тэхн. відах спорту (1961). Рэкардсменка свету, СССР.

СЛАБАДСКА́Я УКРАІ́НА, гістарычная вобласць у Расіі 17—18 ст. на тэр. сучасных Украіны (Харкаўская, часткі Данецкай, Луганскай і Сумскай абл.) і Рас. Федэрацыі (часткі Варонежскай, Курскай і Белгарадскай абл.). З 2-й пал. 16 ст. засялялася ўкр. казакамі і сялянамі, што ўцякалі сюды з тэр. Украіны, падуладнай Рэчы Паспалітай. Сяліліся слабодамі (адсюль назва). Казацкае насельніцтва стала называцца слабадскімі казакамі. С.У. з поўначы засялялі рус. *служылыя людзі* і збеглыя сяляне. З пач. 18 ст. ўрад рассяляў тут вял. групы выхадцаў з тур. уладанняў (малдаван, сербаў і інш.). У 1765 на тэр. С.У. ўтворана Слабодска-Укр. губ., якая ў 1835 перайменавана ў Харкаўскую губерню.

СЛАБАДСКІ́ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1926—27, калі цэнтр раёна з Мазыра быў перанесены ў в. Слабада, а *Мазырскі раён* 5.10.1926 перайменаваны ў Слабадскі. Уваходзіў у Мазырскую акругу, падзяляўся на 14 сельсаветаў. 4.8.1927 раён скасаваны, сельсаветы перададзены Калінкавіцкаму, Каралінскаму, Нараўлянскаму і Петрыкаўскаму р-нам.

СЛАБАДСКО́Е ВО́ЗЕРА. У Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Свячанка (цячэ праз возера), за 11 км на З ад г.п. Бешанковічы. Пл. 0,94 км², даўж. 2,7 км, найб. шыр. 500 м, найб. глыб. 22 м. Пл. вадазбору 491 км². Катлавіна лагчыннага тыпу. Злучана ручаём з воз. Чорнае.

СЛАБАДСКО́Е ВО́ЗЕРА. У Вілейскім р-не Мінскай вобл., у бас. р. Нарач, за 25 км на ПнЗ ад г. Вілейка. Пл. 0,86 км², даўж. 1,5 км, найб. шыр. 0,77 км, найб. глыб. 11 м, даўж. берагавой лініі 3,75 км. Пл. вадазбору 6,14 км². Катлавіна рэшткавага тыпу. Схілы выш. 1—4 м, параслі лесам, часткова разараныя. Пойма шыр. да 20 м, забалочаная, укрыта хмызняком. Берагі нізкія, пясчаныя, пад хмызняком, месцамі забалочаныя; на ПнЗ абразійныя, тарфяністыя. У прыбярэжнай зоне дно пясчанае, глыбей сапрапелістае. Паласа прыбярэжнай расліннасці шыр. да 50 м. Выцякае ручай у р. Нарач.

СЛА́БАЕ ЎЗАЕМАДЗЕ́ЯННЕ, у з а е м а д з е я н н е Ф е р м і, адно з *узаемадзеянняў элементарных часціц* паміж ферміёнамі ў адзіным (лакалізаваным) пункце прасторы-часу. Значна слабейшае за моцнае і эл.-магн., аднак значна мацнейшае за гравітацыйнае ўзаемадзеянне.

С.ў. не лічыцца фундаментальным, разглядаецца як праяўленне 2 паслядоўных *электраслабых узаемадзеянняў* паміж часціцамі. Для С.ў. характэрна парушэнне законаў захавання дзіўнасці, цотнасці, чароўнасці і інш. Абумоўлівае павольныя распады элементарных часціц (напр., бэта-распад нейтрона і ядраў атамаў), узаемадзеянне нейтрына з рэчывам, рассеянні лептонаў на лептонах ці адронах і інш. С.ў. тлумачацца працэсы ўтварэння энергіі на Сонцы і зорках, у час выбухаў звышновых зорак С.ў. нараджае магутныя патокі нейтрына.

Літ.: О к у н ь Л.Б. Слабое взаимодействие элементарных частиц. М., 1963; Я г о ж. Лептоны и кварки. 2 изд. М., 1990.

І.С.Сацункевіч.

СЛАБАЖА́НІНА Кацярына Іванаўна (н. 10.3.1945, г.п. Лельчыцы Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне біяфізікі. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (2000), д-р біял. н. (1992). Скончыла БДУ (1967). З 1967 у Ін-це фотабіялогіі Нац. АН Беларусі (з 1993 нам. дырэктара, адначасова з 1999 заг. лабараторыі). Навук. працы па пытаннях структурнай рэарганізацыі мембран эрытрацытаў пры паталогіі і старэнні клетак in vivo і in vitro, а таксама пад уплывам фізіка-хім. фактараў. Распрацавала шэраг метадаў фотадыягностыкі захворванняў. Дзярж. прэмія Беларусі 1992.

Тв.: Спектральный люминесцентный анализ в медицине. Мн., 1989 (разам з Я.А.Чарніцкім).

СЛАБАЖА́НКА, вёска ў Хойніцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр Алексіцкага с/с і камунальнага унітарнага с.-г. прадпрыемства. За 19 км на З ад горада і 24 км ад чыг. ст. Хойнікі, 121 км ад Гомеля. 405 ж., 158 двароў (2001). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЛАБІ́ЛЬНЫЯ СРО́ДКІ, лекавыя сродкі, якія паскараюць апаражненне кішэчніка. Адрозніваюць С.с., якія ўздзейнічаюць пераважна на тонкі кішэчнік (рыцына), тоўсты кішэчнік (прэпараты кораня рэвеню, кары крушыны, ліслця сены, міндальны і вазелі-

навы алей, сінт. рэчывы — фенолфталеін, ізафенін), на ўсёй працягласці кішэчніка (натрыю і магнію сульфат, карлаварская соль).

Некат. С.с. расл. і сінт. паходжання выклікаюць хім. раздражненне рэцэптараў слізістай кішэчніка, салявыя — мех. раздражненне ў выніку павелічэння аб'ёму і разбаўлення змесціва кішэчніка. Падзяляюць на паслабляльныя (вазелінавы алей), уласна слабільныя (фенолфталеін) і праносныя (салявыя). Ужываюць пры запорах, вострых атручэннях, для ачышчэння кішэчніка і інш. *І.М.Семяненя.*

СЛАБО́ДКА, вёска ў Гудагайскім с/с Астравецкага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса. За 4 км на Пд ад г.п. Астравец, 230 км ад Гродна, 7 км ад чыг. ст. Гудагай. 142 ж., 52 двары (2001). Пач. школа, клуб, б-ка.

СЛАБО́ДКА, вёска ў Бабруйскім р-не Магілёўскай вобл., на аўтадарозе Бабруйск—Слуцк. Цэнтр сельсавета. За 10 км на З ад горада і 12 км ад чыг. ст. Бабруйск, 120 км ад Магілёва. 1129 ж., 180 двароў (2001). ПТВ № 213, дапаможная школа-інтэрнат, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў, магіла ахвяр фашызму. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЛАБО́ДКА, вёска ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., паміж азёрамі Поцех, Недрава і Ільмёнак, на аўтадарозе Браслаў—Друя. Цэнтр сельсавета. За 9 км на ПнУ ад г. Браслаў, 220 км ад Віцебска, 21 км ад чыг. ст. Друя. 860 ж., 387 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, абл. псіхіятрычная і ўчастковая бальніцы, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Лабараторыя азёразнаўства БДУ, турысцкая база нац. парку Браслаўскія азёры, летнія базы адпачынку. Помнік архітэктуры — *Слабодкаўскі касцёл Сэрца Ісуса.* Каля вёскі 2 гарадзішчы *днепра-дзвінскай культуры.*

У гіст. крыніцах вядома таксама пад назвамі Слабада, Слабодка Заверская, Быхаўка, Юзафова. Упершыню ўпамінаецца ў 1618 як паселішча Друйскага двара. У інвентары Браслаўскага старостава за 1649 згадваецца як мяст. Слабада. У 18—19 ст. адносілася да маёнтка Завер'е, што належала Мірскім. У 1806 С.Мірскі фундаваў буд-ва мураванага касцёла. У сярэдзіне 19 ст. С. — мястэчка, цэнтр воласці Новаалександраўскага пав. Ковенскай губ., 303 ж., 27 двароў, валасное праўленне, пазыковая каса, касцёл. У 1865 адкрыта нар. школа. 643 ж., 124 двары (1897). У 1-ю сусв. вайну побач з мястэчкам пабудавана вузкакалейка, якая ў 1920—60-я г. дзейнічала як пасажырская лінія. Летам 1919 С. была адным з цэнтраў антыбальшавіцкага паўстання «зялёных». З 1920 у складзе Польшчы, цэнтр гміны Браслаўскага пав. Віленскага ваяв. У 1931 у С. 848 ж., 146 двароў, чыг. станцыя, школа, пошта, аптэка, карчма, крамы. З 1939 у БССР, з 12.10.1940 цэнтр сельсавета ў Браслаўскім р-не. *К.С.Шыдлоўскі.*

СЛАБО́ДКАЎСКІ КАСЦЁЛ СЭ́РЦА ІСУ́СА, помнік архітэктуры неараманскага стылю ў в. Слабодка Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. Пабудаваны ў 1903 з цэглы на невялікім узгорку. Касцёл — 3-нефавая 2-вежавая базіліка з апсідай, трансептам і сакрысціямі. Гал. фасад сфарміраваны 2 высокімі 5-ярусным вежамі з вострымі шатровымі вярхамі і параўнальна невял. фасаднай плоскасцю цэнтр. нефа паміж імі. Сцены прарэзаны паўцыркульнымі, лучковымі і круглымі аконнымі праёмамі з вітражамі (каляровае шкло захавалася часткова). Над гал. уваходам і на фасадных плоскасцях трансепта размешчаны вял. вокны-ружы. Сцены раскрапаваны ступеньчатымі контрфорсамі, якія на бакавых фасадах злучаны з дэкар. аркбутанамі. Уваходы ў выглядзе аднатыпных парталаў з паўцыркульнымі праёмамі. Вял. маст. каштоўнасць маюць жалезныя акоўкі дзвярэй касцёла, выкананыя мясц. кавалём. Пры кампазіцыйным адзінстве аковак усіх дзвярэй дэталі не паўтараюцца, што сведчыць пра свабодную імправізацыю майстра. Арыгінальную, багатую па форме і складаную па малюнку кампазіцыю маюць акоўкі дзвярэй цэнтр. ўвахода, выраш аныя як пышныя букеты з арнаментальных элементаў, якія паўтараюцца ў кампазіцыях дэкору бакавых дзвярэй. *С.Г.Багласаў, М.М.Яніцкая.*

Слабодкаўскі касцёл. Сэрца Ісуса. Уваходны партал.

У.Слабодчыкаў. Вербніца. 1988.

СЛАБО́ДЧЫКАЎ Уладзімір Іванавіч (н. 21.4.1952, в. Даўгінава Вілейскага р-на Мінскай вобл.), бел. скульптар. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1975). З 1975 выкладаў у Бел. рэсп. школе-інтэрнаце па музыцы і выяўл. мастацтве, з 1989 заг. кафедры Бел. АМ. Працуе ў станковай, манум. і паркавай скульптуры, дробнай пластыцы, медальерным мастацтве. Аўтар кампазіцый «Дон Кіхот» (1973), «Мастак і мадэль» (1976), «Артысты тэатра лялек» (1980), «Спелыя яблыкі», «Максім Багдановіч» (абодва 1981), «Мой родны кут, як ты мне мілы...» (1982), «Арфей і муза» (1983), «Удовы. 1945 г.» (1985), «Францыск Скарына» (1986), «Зімовыя пацешкі», «Вербніца» (абедзве 1988), «Рагнеда» (1989), «Дзяды», «Анёл з апаленымі крыламі» (абедзве 1990), «Прысвячэнне Шагалу» (1994), «Вялікая жаночая фігура» (2002), нізка «Біблейскія сюжэты» (1993—97). Выканаў помнікі беларусам, якія загінулі па-за межамі Беларусі (1997), «Загінуўшым за сяброў сваіх», В.Ваньковічу (абодва 2002) у Мінску, мемар. знак М.Багдановічу (1992), мемар. дошку С.Манюшку (1999), скульптуры для Нясвіжскага парку (1988—89), «Чалавек» у г. Оберкірхен (Германія, 2000), серыю паркавых скульптур для г. Бадэн (Швейцарыя, 2001), партрэты, медалі. Творчасці ўласцівы пластычнасць, акругласць форм, сімвалічнасць маст. мовы. Іл. гл. таксама да арт. *Скульптура драўляная.* *Т.В.Пешына.*

СЛА́ВА ПЕРАМО́ЖЦАМ, раннявосеньскі сорт яблыні. Выведзены ў Мліеўскім НДІ садоўніцтва (Украіна) скрыжаваннем сартоў Папіраўка і Мекінтош. Уключаны ў Дзярж. рэестр для выкарыстання ў вытв-сці ў Брэсцкай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях.

Дрэва сярэднярослае, з кронай сярэдняй гушчыні, круглаватай формы. Сорт скараспелы, высокаўраджайны, няўстойлівы да грыбных хвароб, зімаўстойлівы. Пладаносіць на 4—5 год. Плады вышэй сярэдняй велічыні (каля 120—140 г), ад круглаватай да канічнай формы. Скурка зеленавата-жоўтая з яркачырв. размытымі палосамі. Мякаць крэмавабелая, сакавітая, дробназярністая, кіславатасалодкая. Здымная спеласць у 1-й пал. вер., плады захоўваюцца каля месяца. *З.А.Казлоўская.*

СЛАВА́КІ (саманазва славацы), народ, асн. насельніцтва *Славакіі* (4,5 млн. чал., сярэдзіна 1990-х г.). Жывуць таксама ў ЗША (530 тыс. чал.), Чэхіі (390 тыс. чал.), Венгрыі (80 тыс. чал.), Сербіі (67 тыс. чал.), Канадзе (25 тыс. чал.), Польшчы і Румыніі (па 22 тыс. чал.).

Гавораць на *славацкай мове*. Вернікі пераважна католікі, ёсць пратэстанты і грэка-католікі.

Слава пераможцам.

СЛАВА́КІЯ (Slovensko), Славацкая Рэспубліка (Slovenská republika), дзяржава ў Цэнтр. Еўропе. Мяжуе на З з Аўстрыяй, на ПнЗ з Чэхіяй, на Пн з Польшчай, на У з Украінай, на Пд з Венгрыяй. Пл. 49 тыс. км². Нас. 5408 тыс. чал. (2000). Дзярж. мова — славацкая. Сталіца — г. *Браціслава*. Падзяляецца на 8 краёў. Нац. свята — Дзень утварэння Славацкай Рэспублікі (1 студзеня).

Дзяржаўны лад. С. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1992. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт, які выбіраецца парламентам на 5 гадоў. Заканад. ўлада належыць Нац. савету (аднапалатны парламент, выбіраецца насельніцтвам на 4 гады). Вышэйшы выканаўчы орган — урад на чале з прэм'ер-міністрам, прызначаным прэзідэнтам.

Прырода. Амаль усю краіну займаюць горныя хрыбты *Заходніх Карпат*, што падзяляюцца на асобныя масівы. Пераважаюць сярэдневышынныя горы, у цэнтр. частцы каля мяжы з Польшчай — высака- і сярэднягорны масіў *Татры* (найб. выш. 2655 м, г. Герлахаўскі-Шціт). Нізіны і раўніны — ускраіны *Сярэднедунайскай раўніны*, займаюць невял. плошчы на ПдЗ і ПдУ. Карысныя выкапні: руды жалеза, марганцу, поліметалічныя, радовішчы сурмы, магнезіту; ёсць буры вугаль і лігніт. Клімат умерана кантынентальны. На раўнінах сярэдняя т-ра студз. каля -2 °С, ліп. 19—21 °С. Ападкаў 500—700 мм за год, у гарах да 1000 мм. Рэкі горныя, належаць да бас. р. Дунай (цячэ на ПдЗ). Горныя лясы займаюць каля 35%. На паўд. схілах пераважаюць шыракалістыя (дуб, бук) і мяшаныя, на паўн. — хвойныя (елка, піхта). Даліны і раўніны асвоены. У гарах трапляюцца буры мядзведзь, воўк, рысь, казуля, дзік; шмат птушак. У С. 5 нац. паркаў агульнай пл. 2051 км², 13 запаведнікаў агульнай пл. 6338 км². На мяжы з Венгрыяй сумесны запаведнік з пячорамі Аггтэлека і Славацкага Краса ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

Насельніцтва. Славакі складаюць 85,8%. Жывуць таксама венгры (9,7%, пераважна на Пд), цыганы (1,7%), чэхі (0,8%), украінцы, румыны і інш. Вернікі католікі (82%), евангелісты (8,2%), грэка-католікі (4,9%), прыхільнікі рэфармацкай хрысц. царквы (2,4%) і інш. Сярэдняя шчыльн. 110,4 чал. на 1 км², найб. (да 200—300 чал. на 1 км²) на раўнінах і ў міжгорных далінах, найменшая (каля 10—20 чал. на 1 км²) у гарах. Натуральны прырост блізкі да нулявога. У гарадах жыве 57% насельніцтва. Найб. гарады (тыс. ж., 1999): Браціслава — 450, Кошыцы — 236; у гарадах Банска-Бістрыца, Жыліна, Нітра, Прэшаў, Трнава прыкладна па 100 тыс. ж. У прам-сці і буд-ве занята 34,6% эканамічна актыўнага насельніцтва, у гандлі — 14,2%, у сельскай гаспадарцы — 9,7%, у сферы паслуг і кіраванні — 41,5%.

Гісторыя. Тэр. С. заселена з часоў сярэдняга палеаліту. Тут жылі *кельты*, якіх у 1 ст. н.э. выцеснілі германцы. У час *Вялікага перасялення народаў* землі С. каля 5—6 ст. каланізаваны славянамі (этнонім «славені»). Яе паўд. раёны ўваходзілі ў склад дзяржавы *Сама*. Першым паліт. аб'яднаннем на тэр. С. ў пач. 9 ст. было Нітранскае княства ў далінах рэк Ваг і Нітра. Каля 833 яно далучана да Мараўскага княства і ўвайшло ў склад *Вялікамараўскай дзяржавы*. З пач. 9 ст. ў С. праз ням. місіянераў пашыралася хрысціянства, г. Нітра стаў цэнтрам епіскапства. З 863 у Вял. Маравіі ажыццяўлялася рэліг.-асв. дзейнасць *Кірылы і Мяфодзія*, якія пашыралі слав. пісьменнасць і богаслужэнне на слав. мове. Аднак у выніку інтрыг ням. духавенства і палітыкі рым. папства развіццё слав. культуры ў С. было перапынена і ўмацаваліся пазіцыі лацінамоўнай рым.-каталіцкай царквы. У 11 ст. С. ўключана ў Венг. каралеўства, што перапыніла працэс утварэння славацкай народнасці і прывяло да частковай мадзьярызацыі, асабліва феад. вярхоў. Паўд. і зах. раёны С. (т.зв. Верхняй Венгрыі) найб. развіваліся ў Венг. каралеўстве. У 12—13 ст. тут фарміравалася феад. і царк. землеўладанне, адносіны залежнасці вольнага сялянства ад феадалаў; хутка раслі гарады (Трнава, Банска-Бістрыца, Трэнчын, Браціслава, Кошыцы); развівалася гарнярудная прам-сць. У пач. 14 ст. зах. і цэнтр. С. на кароткі час дамаглася незалежнасці ад Венгрыі. У 14 ст. С. стала цэнтрам еўрап. транзітнага гандлю. Пад уплывам *гусіцкіх войнаў* у 1440—60-я г. ў С. актывізаваўся антыфеад. рух, скіраваны супраць венг. шляхты і каталіцкай царквы. У 1467 у Браціславе адкрыты каталіцкі ун-т. У 1562 паўд. ч. С. захапіла Турцыя. Уцалелыя ад тур. заваявання славацкія і венг. землі ўвайшлі ў склад імперыі *Габсбургаў*. У 1678 у С. адбылося найбуйнейшае антыгабсбургскае паўстанне венг. магнатаў, падтрыманае Турцыяй. У выніку аўстра-тур. вайны 1683—99 Габсбургі захапілі Паўд. С. і асн. частку Венгрыі. У імперыі Габсбургаў С. была агр.-сыравінным раёнам, яе горныя руднікі належалі аўстр. двару. У час праўлення імператара *Іосіфа II* [1765—90, да 1780 суправіцель *Марыі Тэрэзіі*] праведзены рэформы (у 1781 уведзена свабода веравызнання, у 1785 скасавана асабістая прыгонная залежнасць сялян, ажыццяўляўся мытны і мануфактурны пратэкцыянізм і інш.), якія спрыялі ажыўленню прам-сці ў С. У канцы 18 — пач. 19 ст. адраджаўся славацкі грамадска-культ. нац. рух. Паэт, філолаг і грамадскі дзеяч Л.Штур (1815—56)

Герб і сцяг Славакіі.

рэфармаваў на аснове сяроднеславацкага дыялекту славацкую літ. мову (у 1845 яна кадыфікавана як агульнанацыянальная). На ёй выдаваліся газеты, літ. творы. У 1863 засн. нац.-культ. цэнтр «Маціца славацкая». З утварэннем у 1867 *Аўстра-Венгрыі* С. афіцыйна стала часткай Каралеўства венграў; венг. буржуазія займала пануючае становішча ў эканоміцы С.

У 1-ю сусв. вайну ў С. ўзмацніўся рух за нац. і сац. вызваленне. У 1916 дзеячы чэш. (Т.*Масарык*, Э.*Бенеш*) і славацкай (М.Штэфанік) эміграцыі ўтварылі ў Парыжы Чэхаславацкі нац. савет, які летам 1918 прызнаны ўрадамі краін *Антанты* і ЗША у якасці будучага ўрада дзяржавы чэхаў і славакаў. Ва ўмовах ваен. паражэння і распаду Аўстра-Венгрыі Нац. к-т у Празе (засн. ў 1916) 28.10.1918 абвясціў пра стварэнне незалежнай Чэхаславакіі. Гэтае рашэнне падтрымаў Славацкі нац. савет у г. Марцін, які 30.10.1918 абвясціў пра аддзяленне С. ад Венгрыі. Са студз. 1919 у Браціславе дзейнічала мін-ва Чэхаславакіі па справах С. Непрацяглы час (16.6—7.7.1919) на частцы тэр. С. існавала Славацкая сав. рэспубліка (кіраўнік — чэш. камуніст А.Янаўшак), створаная пры дапамозе войск Венг. сав. рэспублікі. Адносна адсталая прам-сць С. не вытрымлівала канкурэнцыі з чэшскай і скарачалася, што вяло да масавага беспрацоўя і эміграцыі. Пасля *Мюнхенскага пагаднення 1938* клерыкальна-нацыяналіст. Глінкаўская славацкая нар. партыя і інш. партыі прымусілі ўлады Чэхаславакіі пагадзіцца з утварэннем у С. свайго ўрада на чале з лідэрам глінкаўцаў І.Цісам. У ліст. 1938 да Венгрыі адышлі паўд. раёны С. 14.3.1939 па патрабаванні А.Гітлера славацкі сейм абвясціў «самаст. і незалежную Славацкую дзяржаву», якую 18 сак. фаш. Германія ўзяла «пад сваю абарону». Нацысты ўсталявалі ў С. таталітарны рэжым. Паводле ваен. дагавору паміж С. і Германіяй (жн. 1939) славацкія войскі ў 2-ю сусв. вайну ўдзельнічалі ў ваен. дзеяннях супраць Польшчы і СССР. Масавы характар набыў пераход славацкіх ваеннаслужачых на бок Чырв. Арміі (папаўнялі Чэхаславацкі армейскі корпус ген. Л.*Свобады*) і сав. партызан (на тэр. Беларусі і Украіны дзейнічаў славацкі партыз. атрад на чале з маёрам Я.*Налепкам*). Масавы партыз. рух разгарнуўся і на тэр. самой С. У канцы 1943 прадстаўнікі Кампартыі С. (КПС) і інш. апазіц. партый стварылі Славацкі нац. савет (СНС), які ўзначаліў *Славацкае нацыянальнае паўстанне 1944* супраць гітлераўскіх войск (25.8.1944 увайшлі ў С.) і рэжыму Цісы. У студз. 1945 сав. войскі ўступілі ў С., 4 крас. вызвалены г. Браціслава. На вызваленай тэр. С. ўладу ўзяў адноўлены СНС. У паслявае. Чэхаславакіі паўнамоцтвы органаў славацкага нац. прадстаўніцтва (СНС і Корпус упаўнаважаных), дзе ў 1946—48 мела перавагу Дэмакр. партыя, былі абмежаваны на карысць цэнтр. улад Чэхаславакіі. У лют. 1948 да ўлады ў С., як і ў Чэхіі, прыйшлі камуністы. У вер. 1948 КПС увайшла ў адзіную Кампартыю Чэхаславакіі (КПЧ), захаваўшы арганізац. самастойнасць. У краіне фармальна захоўвалася шматпартыйнасць пры фактычным панаванні камуністаў, якія ажыццяўлялі праграму сацыяліст. пераўтварэнняў ва ўсіх сферах жыцця. Канстытуцыя 1960 абвясціла Чэхаславакію дзяржавай раўнапраўных народаў, славацкі Корпус упаўнаважаных быў аб'яднаны з СНС. Падзеі *«Пражскай вясны»* 1968 паспрыялі адраджэнню славацкіх нац. памкненняў. Паводле Канстытуцыйнага Закона 1968 С. з 1.1.1969 — раўнапраўная сацыяліст. рэспубліка (ССР) у складзе Чэхаславацкай Сацыяліст. Рэспублікі (ЧССР) са сваім заканад. органам (СНС) і ўрадам, які прызначаў Прэзідыум СНС. На працягу 1960—80-х г. С. стала развітой індустр.-агр. рэспублікай, палепшыўся дабрабыт насельніцтва і яго культ. ўзровень. Аднак у параўнанні з Чэхіяй, у С. захоўвалася адносная эканам. адсталасць. Славацкія і чэш. дэмакр. сілы разам удзельнічалі ў *«аксамітнай рэвалюцыі» 1989*, у выніку якой ад улады ў ЧССР адхілены камуністы і абвешчаны курс на аднаўленне рыначнай эканомікі. Сярод паліт. сіл С. ў гэты час дамінаваў рух «Грамадскасць супраць насілля». У 1990 чэш.-славацкія адносіны абвастрыліся і ЧССР пераадолець гэтыя негатыўныя з'явы. Да 1998 улада ў С. знаходзілася ў руках кааліцыі на чале з РЗДС, а яе лідэр У.*Мечыяр* у 1994—98 быў прэм'ер-міністрам, у сак.—вер. 1998 в.а. прэзідэнта рэспублікі (пасля адстаўкі М.*Ковача*, які быў прэзідэнтам у лют. 1993 — сак. 1998). На выбарах у Нац. савет у вер. 1998 перамагла апазіц. Славацкая дэмакр. кааліцыя (СДК) у складзе Партыі левых дэмакратаў (ПЛД, б. камуністы), Кааліцыі венг. партый (КВП) і Партыі грамадзянскай згоды (ПГЗ). З 30.8.1998 лідэр СДК М.Дзурында — прэм'ер-міністр С., прэзідэнтам 29.5.1999 выбраны лідэр ПГЗ Р.Шусцер. С. — чл. ААН (з 1993), асацыіраваны чл. Заходнееўрап. саюза (з 1996). Дыпламат. ад-

Да арт. **Славакія**. Горнае возера ў Татрах.

Да арт. **Славакія**. Высокія Татры зімой.

носіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены 14.1.1993. Гл. таксама *Чэхаславакія*.

Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі. РЗДС, Дэмакр. саюз С., ПЛД, Славацкая нац. партыя, Хрысц.-дэмакр. рух, ПГС, КВП і інш. Асн. прафс. аб'яднанне — Канфедэрацыя прафсаюзаў Славацкай Рэспублікі.

Гаспадарка. С. — індустр.-агр. краіна. Пасля 1993 праведзена эканам. рэформа ў гаспадарцы, стабілізавана грашовая сістэма, што суправаджалася адмовай ад дзярж. рэгулявання цэн, лібералізацыяй гандлю і прыватызацыяй. Вялікую ролю ў эканам. рэфармаванні адыгралі замежныя інвестыцыі (каля 0,5 млрд. дол. штогод). У 1998 валавы ўнутр. прадукт (ВУП) склаў 44,5 млрд. дол., каля 8300 дол. на чалавека. 22% ВУП ствараецца ў прам-сці, 6% — у сельскай гаспадарцы, каля 9% — у транспарце і сувязі, 23% у гандлі, 40% — у інш. абслуговых галінах. Горназдабыўная прам-сць занята здабычай бурага вугалю і лігнітаў (раён гарадоў Гандлава і Пр'евідза), жал., марганцавых, свінцова-цынкавых і медных руд. Электраэнергетыка засн. на выкарыстанні гідрарэсурсаў (ГЭС на горных рэках, у т.л. каскад 16 ГЭС на р. Ваг), буйны: Браціслава (хім. і нафтахім., маш.-буд., станкабуд., тэкст., паліграф., харчасмакавая, швейная і інш.), Кошыцы (чорная металургія, цяжкае машынабудаванне), Банска-Бістрыца (каляровая металургія, маш.-буд., дрэваапр., тэкст., цэм., харчовая), Жыліна (маш.-буд., тэкст., цэлюлозна-папяровая, хім.), Нітра (маш.-буд., піваварная, хім., тэкстыльная), Прэшаў (маш.-буд., тэкст.), Комарна (рачное суднабудаванне), Шаля (з-д азотных угнаенняў на імпартным прыродным газе). Штогод атрымліваюць (млн. т): бурага вугалю і лігніту — каля 5, жалезнай руды — 1, свінцова-цынкавай — 0,3, меднай — 0,3, чыгуну — 3,2, пластмас — 0,4, азотных угнаенняў — 0,2, цэменту — 3, нафтапрадуктаў — 3,5; піва — каля 4 млн. гекталітраў. Развітая шматгаліновая сельская гаспадарка засн. на сучаснай матэрыяльна-тэхн. базе і інфраструктуры. С.-г. кааператывы і дзяржгасы трансфармаваны ў кааператывы ўласнікаў і акцыянерныя прадпрыемствы. С.-г. ўгоддзі займаюць 2445 тыс. га, у т.л. пад ворывам і шматгадовымі насаджэннямі каля 1630 тыс. га, пад пашай і лугамі каля 815 тыс. га. Асн. галіна сельскай гаспадаркі — раслінаводства. Большасць пасеваў засяроджана ў раўнінных раёнах на ПдЗ, Пд, ПдУ і ў далінах рэк; лугі і паша — у горах. Штогод збіраюць (млн. т): пшаніцы — каля 2, ячменю — 1, кукурузы — 0,7, жыта — 0,1. Вырошчваюць таксама бульбу, алейныя культуры (сланечнік, рапс), цукр. буракі, тытунь, агародніну. Садоўніцтва, на Пд — вінаградарства. Пагалоўе (1997, млн. галоў): буйн. раг. жывёлы — 0,7, свіней — 1,6, авечак — 0,3. Птушкагадоўля (у 1997 — 13,1 млн. курэй). У паўд. раёнах гадуюць пераважна свіней, малочную буйн. раг. жывёлу, птушку, у горных раёнах — авечак і мясную буйн. раг. жывёлу. Транспарт чыг., аўтамаб., унутр. водны. Даўж. (тыс. км): чыгункі — 3,7, аўтадарог — 17,7, унутр. водных шляхоў (участак Дуная і нізоўі асн. прытокаў) каля 0,4. У краіне (2000) 994 тыс. легкавых, 94 тыс. грузавых аўтамабіляў і аўтобусаў. Асн. рачныя парты Браціслава і Комарна. Авіяц. транспарт абслугоўвае пераважна знешнія пасажырскія зносіны, гал. міжнар. аэрапорты каля Браціславы, Кошыц, Попрада. С. перасякаюць з У на З нафта- і газаправоды з Расіі ў Зах. Еўропу. У 1998 экспарт склаў 10,7 млрд. дол., імпарт — 12,9 млрд. дол. Гал. тавары экспарту: машыны і абсталяванне, прадукцыя нафтаперапр., хім., дрэваапр., харч. прам-сці. Імпартуюцца машыны і абсталяванне, нафта, хім. сыравіна і інш. Важнейшыя гандл. партнёры: Чэхія (35%), Германія (19%), Аўстрыя (5%), Расія, Польшча, Італія. У 2000 Беларусь экспартавала ў С. тавараў на 19,2 млн. дол. (пераважна халадзільнікі, маразільнікі, шыны), імпартавала тавараў на 12,8 млн. дол. С. — краіна развітога турызму і горнага спорту. Штогод С. наведвае каля 0,5 млн. замежных грамадзян, даход ад замежнага турызму ў 1998 склаў 461 млн. дол. Грашовая адзінка — славацкая крона.

Да арт. **Славакія**. Узбярэжжа р. Дунай у Браціславе.

Узброеная сілы. Уключаюць рэгулярныя ўзбр. сілы, а таксама ваенізаваныя фарміраванні, у т.л. сілы ўнутр. бяспекі (1,4 тыс. чал.), грамадз. абароны (1,2 тыс. чал.) і інш. (2000). Вярх. галоўнакамандуючы — прэзідэнт. Камплектаванне паводле прызыву. Тэрмін службы — 1 год. Рэгулярныя ўзбр. сілы складаюцца з сухап. войск, ВПС і ППА. У сухап. войсках 23,8 тыс. чал., каля 480 танкаў, больш за 680 баявых браніраваных машын, да 390 адзінак палявой артылерыі, мінамётаў, рэактыўных сістэм залпавага агню і інш. У ВПС і ППА 12 тыс. чал., больш за 100 баявых самалётаў, каля 60 верталётаў, у т.л. 19 баявых, каля 100 пускавых установак зенітных кіроўных ракет і інш.

Ахова здароўя. Насельніцтва атрымлівае бясплатную дзярж. мед. дапамогу, карыстаецца паслугамі страхавой і прыватнай медыцыны. Сярэдняя працягласць жыцця мужчын 70, жанчын — 77 гадоў. Узровень нараджальнасці — 10 на 1 тыс. чал., смяротнасць — 9 на 1 тыс. чал. Натуральны прырост 0,1%. Дзіцячая смяротнасць — 9 на 1 тыс. нованароджаных (2001). Забеспячэнне бальнічнымі ложкамі — 1 на 86 чал., урачамі — 1 на 381 чал. (1996).

Асвета. Сучасная сістэма адукацыі С. ўключае дашкольныя ўстановы (для дзяцей 3—5-гадовага ўзросту), асн. школы, гімназіі, сярэднія прафес. школы і вучылішчы, ВНУ. Пераважная большасць устаноў дзяржаўныя; ёсць прыватныя і царкоўныя. Асн. школа для дзяцей з 6-гадовага ўзросту мае 2 ступені — пач. (4 гады навучання) і нявопўную сярэднюю (5 гадоў) і з'яўляецца абавязковай. Поўную сярэднюю адукацыю (пасля асн. школы) даюць гімназіі (4 гады навучання), некаторыя сярэднія прафес. вучылішчы (4—5 гадоў навучання), большасць сярэдніх прафес. школ, у якіх вучні праходзяць і карот-

катэрміновае прафес. навучанне, пераважна па складаных профілях. У гімназіях уведзена дыферэнцыраванае навучанне (гуманіт. і тэхн. профілі) з улікам індывід. схільнасцей навучэнцаў, выкарыстоўваюцца навуч. праграмы з павышаным узроўнем патрабаванняў. У сістэме вышэйшай адукацыі — ун-ты, вышэйшыя школы, акадэміі. У 2000/01 навуч. г. ў С. 3245 дзярж. дашкольных устаноў (больш за 153 тыс. дзяцей), 2362 асн. школы (каля 626 тыс. вучняў і больш за 38 тыс. настаўнікаў), 157 гімназій (больш за 67 тыс. навучэнцаў і больш за 5 тыс. выкладчыкаў), 309 сярэдніх прафес. школ (каля 85 тыс. навучэнцаў), 363 сярэднія прафес. вучылішчы (больш за 104 тыс. навучэнцаў). У сістэме вышэйшай адукацыі больш за 20 навуч. устаноў. Буйнейшыя ВНУ: ун-т Я.А.Каменскага (з 1465), эканам. і Славацкі тэхн. ун-ты, Паліцэйская акадэмія, вышэйшыя школы — выяўл. мастацтва і тэатральна-мастацкая (усе ў Браціславе); Ун-т Мацея Бела і Акадэмія мастацтваў у Банска-Бістрыцы; Ун-т Паўла Іозефа Шафарыка, тэхн. і вет. ун-ты, Ваенная лётная акадэмія (усе ў Кошыцах); Ун-т Канстанціна Філосафа і Славацкі аграрны ун-т у Нітры; Ваенная акадэмія ў Ліптаўскі-Мікулашы, Ун-т Кірылы і Мяфодзія ў Трнаве, тэхн. ун-т у Зволене; ун-ты ў Прэшаве, Трнаве, Жыліне, Трэнчыне і інш. У С. больш за 70 б-к і больш за 75 музеяў. Буйнейшыя б-кі: універсітэцкая ў Браціславе, Дзярж. навук. ў Кошыцах, акрамя таго працуе 9 навук. б-к і Цэнтр. навукова-тэхн. інфармацыі ў Браціславе. Буйнейшыя музеі: Славацкі нац. (мае 8 філіялаў), Гарадскі ў Браціславе, Славацкі тэхн. ў Кошыцах, Музей він у Прэшаве, Музей славацкага нац. паўстання ў Банска-Бістрыцы, этнагр. ў Марціне. Навук. даследаванні праводзяцца на кафедрах ун-таў, у Славацкай АН (з 1952), якая ўключае больш за 60 ін-таў і лабараторый, і інш. н.-д. установах.

Друк, радыё, тэлебачанне. У 1999 у С. выходзілі газеты «Pravda» («Праўда», з 1920), «Praca» («Праца», з 1946), «Smena» («Змена», з 1948), «Večer» («Вечар», з 1990), «Narodna obroda» («Нацыянальнае адраджэнне», з 1990), штотыднёвік «Beseda» («Размова», з 1990) і інш. Інфарм. агенцтва — Тэлегр. агенцтва Славацкай Рэспублікі (TACP, з 1992). Радыёвяшчанне з 1926; асн. праграмы — «Браціслава» і «Дэвін». Тэлебачанне з 1956 (з 1970 каляровае); вяшчанне па 2 каналах.

Літаратура. Развіваецца на *славацкай мове*. Вытокі пісьменнасці славакаў звязаны з дзейнасцю Кірылы і Мяфодзія (2-я пал. 9 ст.). У 15 ст. пісьмовай мовай была латынь. Пашыраны былі легенды (жыціі), драм. рэліг. творы і духоўная лірыка (не захаваліся). Вял. значэнне для культ. жыцця С. мела заснаванне Карлам IV у Празе універсітэта (1348). Ідэі гусіцкага руху (1-я пал. 15 ст.) і Рэфармацыі паспрыялі выцясненню латыні чэш. пісьмовай мовай з элементамі славацкай гутарковай мовы. Вядома творчасць паэтаў-гуманістаў М.Ракаўскага, Я.Якобеўса, духоўная паэзія Я.Сільвана, Э.Лані. Барацьба з тур. нашэсцем (канец 15—16 ст.) спарадзіла гераіка-эпічныя песні і балады на гіст. сюжэты. З'явіліся творы з любоўнай праблематыкай (вершаваны раман «Пра Сілада і Хадмазі», 2-я пал. 16 ст.), драматургія на біблейскія сюжэты П.Кырмезера і Ю.Тэсака. У 17—18 ст. узмацніўся ўплыў каталіцкай царквы, свецкія матывы выцясняліся рэліг. містыкай. Выявілася блізкасць да л-ры еўрап. барока: дыдактычна-рэфлексіўныя творы П.Беніцкага, О.Луцэ, мемуарная проза Ш.Піларыка, Т.Масніка, С.Грушкавіца, свецкая паэзія Г.Гаўлавіча. Самастойнасць набыло літ.-знаўства (Д.Цвітынгер, П.Валаскі). З канца 18 ст. пачалося нац. адраджэнне славацкай пісьменнасці, спробы стварэння нац. мовы (А.Берналак). Рэфарматар мовы і аўтар першага славацкага рамана — І.І.Байза. Вядомасць набыла паэзія *Я.Колара*, Б.Табліца, проза Я.Голага, навук. працы Ю.Фандлі, П.І.Шафарыка, драмы Я.Халупкі. У 1840—70-я г. ў л-ры ўсталяваўся рамантызм (паэт. цыкл «Думкі вечаровыя» Л.Штура, паэмы і лірыка *Я.Краля*, А.Сладкавіча, паэмы-казкі Я.Боты, гіст. аповесці Я.Калінчака, І.М.Гурбана). У 1863—75 навук.-асветніцкае і літ. т-ва «Маціца славацкая» выдавала кнігі, часопісы, адкрывала школы, гімназіі. З 1880-х г. вядучым кірункам стаў рэалізм (творчасць С.Ваянскага, П.*Гвездаслава*, М.Кукучына). Значнае месца занялі пераклады з рус. і зах.-еўрап. л-ры. У творчасці пісьменнікаў-рэалістаў Цімравай, *Я.Есенскага*, І.Таяўскага (прадстаўнікі «Маладой Славакіі») узмацніўся сац.-аналіт. падыход да рэчаіснасці. У пач. 20 ст. ўзнік літ. рух т.зв. Славацкай мадэрны, які выявіўся ва ўзбагачэнні эмацыянальнага зместу і псіхал. раскрыцця ўнутр. свету чалавека і кульце формы (І.Краска, І.Гал, У.Рой). Развіццю л-ры спрыяла ўтварэнне Чэхаславацкай рэспублікі. У паэзіі выступілі Ш.Крчмеры, М.Разус, Я.Смрэк, Э.Б.Лукач, Я.Понічан, у прозе — Я.Грушаўскі, Г.Вамаш, М.Урбан, І.Горват, у літ. крытыцы — Э.Уркс, А.Матушка. Вядомасць набылі раманы П.*Ілямніцкага*, паэзія Л.*Новамескага*. Пошукам гармоніі займаўся І.Цыгер-Гронскі. У 2-ю сусв. вайну ў час ням.-фаш. акупацыі побач з падп. л-рай існавалі як форма легальнага пратэсту «лірыза́ваная» проза (Д.Хробак, М.Фігулі, Ф.Швантнер) і паэзія сюррэалістаў (Ю.Ленка, П.Бунчак, Ш.Жары). Тэмы паўстання, антыфаш. барацьбы, пабудовы новага грамадства — гал. ў пасляваен. л-ры (У.*Мінач*, М.Крно, Я.Боданек, Я.Коранка). Умацоўваецца сацыяліст. рэалізм (паэты А.Плаўка, Я.Костра, В.*Мігалік*, празаікі Р.Яшык, Ф.Гечка, К.Лазарава). 1950-я г. — пік псіхал. прозы (А.Беднар, Ф.Краль). У 1960-я г. выявіліся авангардысцкія канцэпцыі і фармальнае эксперыментатарства (Л.Балек, А.Гікіш, Р.Слобада). Нетрадыц. падыход да раскрыцця характараў пераважаў у творах Д.Мітаны, І.Гудзеца, Д.Душака і інш. У 1970-я г. росквіту дасягнуў гіст. раман (І.Тала, Я.Ленч, М.Ферка і інш.). 1980-я г. адметныя ўзлётам раманнай формы, рухам эпасу да сінтэзу, цыклізацыяй малых жанраў (П.Яраш, П.Андрушка, І.Габай і інш.). У канцы 1990-х г. змены жанравага зместу прозы за кошт фальклярызацыі суправаджаліся паглыбленнем лірычнага пачатку. Маральна-філас. пошукі вядуцца ў межах сінтэзу рамана і міфа, легенды, прытчы, балады, драмы і камедыі (В.Шыкула, М.Валек, О.Заграднік, Я.Солавіч і інш.). На бел. мове выдадзены «Чэшскія і славацкія апавяданні» (1958), зб-кі апавяд. «Апошні вераснёвы дзень» (1982), «Разбуджаны голас» (1988), «Соль зямлі» (1992), вершаў «Татры пяюць» (1976), «Славацкая паэзія» (1990), казак «Дванаццаць месяцаў» (1956), «У сонейка ў гасцях» (1958), творы Крно («Я вярнуся жывы», 1960), Мінача («Жывыя і мёртвыя», 1961), Г.Зелінавай («Якубка», 1962), Шыкулы («Канікулы з дзядзькам Рафаэлем», 1972), К.Ярункавай («Брат маўклівага ваўка», 1976), Валека («Крылы», 1978), М.Галямавай («Пра сініцу з какосавага доміка», 1979), Грушаўскага



Да арт. Славакія. Замак у Бойніцах.

(«Янашык», 1980), Э.Гашпаравай («Цяжка быць мустангам», 1981), Р.Морыца («Выбух», 1984). Сярод перакладчыкаў на бел. мову: Я.Бяганская, У.Дамашэвіч, Х.Жычка, У.Караткевіч, Я.Каршукоў, А.Мажэйка, П.Макаль, С.Міхальчук і інш.

Архітэктура. У 1—2 ст. на тэр. С. ўзніклі стараж.-рым. крэпасці. У 9—12 ст. будавалі замкі з хрысц. капэламі (у Браціславе, Бойніцах, Турчанска-Бістрыцы, Спішскі-Градзе), вакол якіх з 13 ст. раслі гарады. Да раманскага стылю належаць базіліка св. Эмерама ў Нітры (1200), 2-ярусная капэла-ратонда ў Скаліцы (12 ст.), 3-нефавая базіліка з 2-вежавым фасадам у Дзякаўцы (1228). З канца 13 ст. пашырана гатычная храмавая архітэктура, адметная нац. стрыманасцю: 3-нефавыя базілікі св. Лізаветы ў Кошыцах (1382—1499), св. Кацярыны ў Банска-Шцяўніцы (1491), сабор св. Марціна (14—15 ст.), Старая ратуша (13—15 ст.) у Браціславе. Для готыкі характэрны зальны тып храма (3-нефавы сабор св. Якуба ў Левачы, 14—15 ст.). Да вялікіх храмаў часам далучалі невял. капэлы з вытанчанымі прапорцыямі (капэлы Запольскіх у Спішска-Капітуле, 1488—93). Гатычныя замкі ўяўлялі сабой комплексы з унутр. дварамі, капэламі (у Стрэчне, 14—15 ст.; Зволен, 1361 — 16 ст.). Гарады мелі ўмацаванні, ратушную плошчу, элементы рэгулярнага плана (Бардзееў, Левача, Трэнчын). Рэнесансавыя прыкметы звязаны пераважна са свецкай архітэктурай: жылыя дамы з атыкамі, парталамі, дваровымі галерэямі, размалёўкамі сграфіта (у Прэшаве, Левачы, Банска-Бістрыцы), ратушы ў Бардзеёве (1508—09), Левачы (1525—86) і інш. Рэспектабельны выгляд мелі познагатычныя ратушы, перабудаваныя ў рэнесансавым ключы (у Браціславе). У 17 ст. пашырыўся стыль барока: касцёлы ун-та ў Трнаве (1637—1700, арх. П.Спеца), св. Тройцы (1717—35, арх. К.Каневале, Ф.А.Хілебрант, І.Б.Фішэр фон Эрлах), св. Альжбеты (1739—42), кляштарны комплекс у Ясаве (1765, арх. абодвух А.Пільграм). Канстр.-вобразнае вырашэнне набыла нар. драўляная архітэктура (касцёлы ў Твардошыне, Фрычцы і інш.). Ад рэспектабельна-ўрачыстых да стрыманавясковых будаваліся замкі і палацы (палац Грасалкавіча ў Браціславе, 1760, цяпер рэзідэнцыя прэзідэнта; замкі ў Маркушаўцы і Банска-Шцяўніцы і інш.). У стылі барока перабудаваны некат. гатычныя абарончыя вежы, касцёлы ў Браціславе, Нітры і інш. З 1770-х г. развіваўся класіцызм, найперш у рэспектабельных палацах (прымаса ў Браціславе, 1781, арх. М.Хефеле). Характэрныя былі т.зв. рэдуты з функцыямі атэляў, т-раў, корчмаў (у Ельшаве, Кежмараку і інш.). Вылучаўся класіцыстычны будынак пратэстанцкага сабора ў Банска-Бістрыцы (1807, арх. М.Полак). З сярэдзіны 19 ст. будавалі ў гіст. стылях (Славацкі нац. т-р у Браціславе, 1884—86, арх. Ф.Фельнер і Г.Гельмер). Пад уплывам сецэсіі працаваў арх. Д.Юркавіч (грамадскі дом у Скаліцы, 1904). Пабудовы пач. 20 ст. ў стылях канструктывізму, неакласіцызму і нар. традыцыях: атэль «Карлтан-Савай» (1928), вышынны будынак «Мандарла», санаторый у Трэнчанске-Цепліцы (1930-я г.). Сярод збудаванняў 2-й пал. 20 ст. зімовы стадыён (1963), мост цераз Дунай (1972) у Браціславе, помнік нац. паўстанню ў Банска-Бістрыцы (1970) і інш.

Да арт. Славакія. Касцёл Архангела Міхаіла ў Фрычцы.

Да арт. Славакія. Ратуша ў Левачы.

Да арт. Славакія. Новы касцёл у Дудзінцах. 1990-я г.

Да арт. **Славакія**. Рэзідэнцыя Прэзідэнта (былы палац Грасалкавіча) у Браціславе.

Да арт. **Славакія**. Атэль «Геліяс» на курорце Штрбске-Плеса.

З 1990-х г. архітэктура С. выпрацоўвае праграму добраўпарадкавання гар. і сельскага асяроддзя. Паводле плана пераўтварэння краіны ў цэнтр культ. сувязей і міжнар. турызму будуюцца атэлі і турыстычныя комплексы, упарадкоўваюцца і мадэрнізуюцца курортныя мясціны. Сучасная свецкая і культавая архітэктура адметная эстэт. культурай, імкненнем да прастаты і функцыянальнасці. Горад-запаведнік Банска-Шцяўніца і ансамбль сярэдневяковых умацаванняў Спішскі-Град уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*. У 1945 засн. Т-ва славацкіх архітэктараў.

Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Стараж. помнікі выяўл. мастацтва на тэр. С. вядомы з эпох палеаліту, неаліту (статуэткі жывёл і людзей, упрыгожанні) і бронзавага веку. Выяўлены творы кельтаў, сарматаў, авараў, протаславян і стараж. славян. Вытокі мастацтва С. ў культуры Вялікамараўскай дзяржавы. У 13—15 ст. пашыраны скульпт. элементы арх. дэкору. Раннім насценным размалёўкам у плоскаснай лінеарнай манеры ўласцівы паўн.-італьян. ўплывы (фрэскі касцёла ў Дэхтыцэ, каля 1175) і рысы рамана-візант. стыляў (фрэскі касцёла ў Драўцэ, пач. 14 ст.). У дэкоры касцёлаў канца 14 — пач. 15 ст. адчуваецца ўздзеянне П.*Парлера*. Статуі мадоннаў сярэдзіны 14 ст. блізкія да франц. готычнай пластыкі, на мяжы 14—15 ст. набылі рысы *«мяккага стылю»*. У жывапісе ўмоўнасць выяў змянялася набліжэннем да рэальнасці (размалёўкі касцёла ў Жэгры з жанравымі матывамі, каля 1400), у насценным і алтарным жывапісе пач. 15 ст. — да выяўлення прасторы і індывідуалізацыі вобразаў (алтар касцёла ў Гронскі-Бенядзіку). У канцы 15 — пач. 16 ст. дасягнула росквіту драўляная алтарная скульптура, у якой познаготычныя традыцыі спалучаліся з рысамі Адраджэння. Вядучым майстрам скульптуры быў Павел з Левачы (Вял. алтар сабора св. Якуба ў Левачы, 1508—15). У пач. 16 ст. ў жывапісе майстра «MS» праявіліся рысы *дунайскай школы*. У 16 ст. пашырылася рэнесансавая скульптура з готычнымі рысамі, у якой прасочваліся аўстр. ўплывы (алтар касцёла ў Юры каля Браціслявы, 1527). Ствараліся рэнесансавыя надмагіллі і круглая дэкар. скульптура («Фантан Роланда» перад ратушай ў Браціславе, 1527). Жывапіс Адраджэння прадстаўлены пераважна арнаментальнымі мініяцюрамі і сграфіта, якімі пакрывалі фасады дамоў, замкаў, званіц. Ва ўсх. С. быў пашыраны іканапіс у познавізант. стылі. У эпоху барока панавала пышная дэкар. скульптура са стука. З каменю і мармуру выкананы манум. арх.-скульптурныя алтары (гал. алтар сабора ў Браціславе, 1732—34, аўстр. скульптар Р.Донер). У канцы 18 ст. з'явілася свецкая партрэтная скульптура. У жывапісе 17—18 ст. пераважалі італьян., нідэрл. і аўстр. ўплывы. Фрэскі з ілюзіяністычнымі эфектамі выконвалі аўстр. майстры (П.Трогер, Ф.Маўльберч). Сярод нешматлікіх мясц. мастакоў — Я.Богдан, С.Генрых, Я.Купецкі. Сярод вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва 15—18 ст. — метал. (часта з перагародчатай эмаллю), фаянсавыя, разьба па дрэве, вышыўка і ткацтва. У партрэтным жывапісе пач. 19 ст. класіцызм спалучаўся з рысамі *бідэрмееру*. Класіцыстычным пейзажам уласцівы рамант. тэндэнцыі (нац. па матывах работы К.Л.Лібая, А.Бродскага, Л.Нюлашы). У перыяд уздыму рэв. і нац.-вызв. руху ствараліся рамант. па кампазіцыі партрэты сучаснікаў, герояў вызв. барацьбы (П.Богунь, І.Б.Клеменс). У канцы 19 — пач. 20 ст. дасягнуў росквіту жанравы жывапіс, у якім рэаліст. рысы, каларыстычныя і пленэрныя пошукі спалучаліся з элементамі акадэмізму (В.Андзьяла, Д.Скуцецкі, І.Ганула). Рэаліст. і сац.-крытычныя тэндэнцыі ўласцівы творам скульптара Я.Коньярака. У фарміраванні нац. школы жывапісу 20 ст. вял. роля належыць М.Бенку, М.Базаўскаму і Я.Алексі, якія развівалі традыцыі постімпрэсіянізму. Рысы фавізму, кубізму і элементы нар. творчасці спалучалі жывапісцы і графікі М.Галанда і Л.Фула, сац.-крытычнай скіраванасцю вызначаліся творы графіка К.Сокала, жывапісца К.Баўэра, скульпт. Ф.Гібалы. У 1939—45 экспрэсіўныя драм. кампазіцыі антыфаш. тэматыкі ствараліся жывапісцы і графікі В.Гложнік, Я.Жэлібскі, Ц.Маернік, Ю.Немчык, скульптар І.Костка, неакласіцыстычныя творы — скульпт. Ю.Горавая-Ковачыкава і інш.

З 1950-х г. пашырыліся творы на тэмы нац.-вызв. барацьбы і працы, індустр. пейзажы (графікі Гложнік, Р.Дубравец, жывапісцы Бенка, Жэлібскі, Б.Хофштэтэр, скульптары Костка, Ц.Бартфай), абагульненыя сцэны нар. жыцця і вобразы сялян (Алексі, Базаў-

Да арт. Славакія. Павел з Левачы. Апостал Якуб. 1508—15.

Да арт. **Славакія.** Л.Нюлашы. Перад навальніцай. Каля 1880.

скі, Фула, Немчык, В.Хмель, М.Чэхава), партрэтны жывапіс (Ф.Драшкавіч, Гібала), камерная станковая пластыка (Я.Куліх, А.Трызуляк), манум.-дэкар. скульптура (Костка, Куліх, Трызуляк). У 2-й пал. 20 ст. абстрактны экспрэсіянізм, неакубізм, сюррэалізм і інш.; развівалі Ю.Бартфай, Л.Гударна, В.Жылінчанава, У.Компанек, Р.Крываш, М.Лалуха, М.Паштака, Л.Сламка, Ф.Студзены, П.Тот, Л.Чэміцкі, В.Хложнік, М.Якабчыц, Ю.Якабы. У дэкар.-прыкладным мастацтве пашыраны габелены, вітражы, кераміка, маст. апрацоўка металу і інш.

Музыка. У муз. фальклоры С. вядомы балады, лірычныя, эпічныя, быт. і абрадавыя песні, пераважна аднагалосыя, з развітой мелодыкай, рытмічнай разнастайнасцю. У 13 ст. з'явіліся т.зв. разбойніцкія песні («разбойнікі» — змагары за правы народа), у 15 ст. — гусіцкія песні, у 16 ст. — гіст., у 18 ст. — песні куруцаў (удзельнікі антыфеад. паўстанняў), у 19 ст. — новавенгерскія. У аснове стараж. мелодый розныя віды тэтрахордаў, часцей мажорныя. Характэрны рэгіянальныя адрозненні. Сярод муз. інструментаў: гайда (валынка), пастухоўскія дудкі, фуяра і інш. Распаўсюджаны танцы: адземок (пастухоўскі тыпу *казачка*), каламыйкі, фрышка (тыпу *кракавяка*). Пачатак кампазітарскай творчасці ў 15 ст. дала культавая поліфанічная хар. музыка (Ю.Банаўскі, Т.Лнтнер). У вак. і вак.-інстр. творах 17 ст. адчувальны ўплывы ням. і італьян. барока (З.Заравуціус, Я.Кусер, І.Шымбрацкі і інш.), развіваюцца свецкія жанры (п'есы для лютні, вёрджынела, танц. сюіты). У 18 ст. пашырыліся царк. і свецкія муз. жанры (кантаты, арыі), французскі пастараль, звязаная з нар. песняй (П.Баян, Э.Пасха), уплывы *венскай класічнай школы*. З пач. 19 ст. выросла цікавасць да нар. песні, фарміруецца нац. муз. культура. Адзін з заснавальнікаў нац. муз. школы — Я.Бела (опера «Віланд», паст. 1926; сімф. паэма «Лёс і ідэал», 1874). Развіццё нац. школы звязана з творчасцю Ф.Кафенды, М.Мойзеса, В.Фігуша-Бістры, М.Шнайдэр-Трнаўскага. У Браціславе створаны оперная трупа Славацкага нац. т-ра (1919), хар. і інш. выканальніцкія калектывы, муз. школа (з 1919; з 1927 Муз. і драм. акадэмія). Уклад у муз. мастацтва С. 20 ст. зрабілі: кампазітары М.Базлік, І.Зельенка, А.Очанаш, Э.Сухань, Я.Цыкер; дырыжоры О.Ленард, Л.Райтар, Л.Словак; піяністы К.Гаўлікава, М.Лапшанскі; скрыпачы Т.Гашпарак, П.Міхаліца; спевакі Г.Бенячкава, Ш.Гоза, Э.Кітнарава, М.Чэсанёва; музыказнаўцы Л.Бурлас, Л.Мокры, З.Новачак і інш. У С. працуюць: Усходнеславацкі нац. т-р у Кошыцах (з 1945), Славацкая філармонія з сімф. аркестрам і хорам (з 1949), Дзярж. камерны аркестр у г. Жыліна і Славацкі камерны аркестр (з 1960), ансамбль нар. песні і танца «Лучніца» (з 1948) і інш.; кансерваторыя (з 1941), Вышэйшая школа прыгожых мастацтваў з муз. факультэтам (з 1949), Ін-т музыказнаўства Славацкай АН (з 1951, усе ў Браціславе). Праводзіцца Міжнар. муз. фестываль «Браціслаўская ліра». У 1955 створаны Саюз кампазітараў С.

Да арт. **Славакія**. К.Сокал. Пара. 1932.

Да арт. **Славакія**. І.Костка. Смутак. 1943.

Да арт. **Славакія**. Л.Гударна. Дзяўчына. 1959.

Тэатр. Першыя тэатр. прадстаўленні ў С., звязаныя з рэліг. рытуаламі, ставіліся на ням., лац., венг., чэшскай мовах. Пашыранымі былі выступленні вандроўных акцёраў на плошчах гарадоў (у 12 ст. забараняліся сінодам). У сярэдневякоўі ўзнікла рэліг. драма (звесткі пра рэліг. спектаклі ў Браціславе і Бардзеёве датуюцца 1439). Першая свецкая п'еса пастаўлена ў 1536 у Браціславе. У 15 — пач. 16 ст. з'явілася школьная драма (школьныя т-ры ў Бардзеёве, Прэшаве, Крэмніцы, Банска-Бістрыцы), ставіліся і творы ант. аўтараў. У эпоху барока дасягнула росквіту езуіцкая драма (Трнава, Скаліца, Трэнчын, Браціслава, Прэшаў, Банска-Бістрыца і інш.). З 17 ст. прадстаўленні адбываліся ў спец. тэатр. залах, з 18 ст. — спец. дамах для т-раў (у 1740 у Браціславе пабудаваны першы 3-павярховы т-р). У пач. 19 ст. ўзнік аматарскі т-р (у 1830 адбылося першае публічнае прадстаўленне на славацкай мове гуртка ў Ліптаўскі-Мікулашы). У 1890 у Марціне пабудаваны Нац. дом, дзе перыядычна ставілі аматарскія спектаклі. У 1920 у Браціславе створаны першы прафес. т-р — Славацкі нац. т-р (засн. Я.Борадач, А.Багар, Г.Кела, О.Орсагава, Г.Мелічкава; да 1932 спектаклі на чэш. мове, пазней арганізавана славацкая трупа). У 1940-я г. сетка прафес. тэатр. калектываў пашырылася, створаны Т-р Славацкага нац. паўстання ў Марціне, Славацкі т-р у Прэшаве (абодва 1944), Новая сцэна ў Браціславе (1946) і інш. З 1960-х г. развіваецца мастацтва лялечнага т-ра (Дзярж. лялечны т-р у Браціславе, Стары т-р у Нітры, «На перакрыжаваннях» у Банска-Бістрыцы, т-ры ў Кошыцах, Жыліне). Славацкі нац. т-р мае драм., оперную і балетную трупы. Працуюць таксама драм. т-ры: Астарка Корза'90 у Браціславе, Андрэя Багара ў Нітры, Дзярж. т-р у Кошыцах, Трнаўскі т-р, тэатры І.Таяўскага ў Зволене, І.Забарскага ў Прэшаве; укр. т-р у Прэшаве, венг. ў Комарне. Праводзяцца міжнар. фестывалі: «Дзівадзельна Нітра», пантамімы ў Браціславе, нетрадыц. т-раў у Пежзінаку, славацкіх лялечных т-раў у Банска-Бістрыцы і інш. Тэатр. кадры рыхтуюць Тэатр. ін-т, Акадэмія музыкі і

драм. мастацтва ў Браціславе, Акадэмія мастацтваў у Банска-Бістрыцы.

Кіно С. ўзнікла і развівалася як частка агульнай экраннай культуры чэхаў і славакаў. У 1920—30-я г. кінадакументалісты з Прагі здымалі ў С. відавыя фільмы пейзажаў Татраў і фалькл. замалёўкі: «Славацкія танцы і спевы» (рэж. Я.Палаўш), «Па гарах, па долах» і «Зямля спявае» (рэж. К.Пліцка). У 1921 з чэш. кінематаграфістамі пастаўлены першы славацкі нямы фільм «Янашык» (рэж. Я.Сіякель і Ф.Горлівы). У 1939—45 увоз чэш. фільмаў у С. быў забаронены. У 1940 створана кінаарганізацыя «Наступ», падпарадкаваная берлінскай студыі «УФА» (пракат і выпуск прапагандысцкіх фільмаў). У 1945 кінапрамысловасць нацыяналізавана; у Браціславе створана Студыя славацкага маст. кіно «Коліба». У 1947 пастаўлены першы поўнаметражны славацкі фільм «Сцеражыся» (рэж. М.Фрыч) пра лёс славакаў-эмігрантаў у Амерыцы. У 1948 заснавальнік славацкага кіно, акцёр кіно і т-ра, сцэнарыст і рэжысёр П.Біелік зняў драму «Воўчыя норы» пра Славацкае нац. паўстанне. Цікавасць да гісторыі народа, да яе легендарных герояў выявілася ў каляровай дылогіі Біеліка «Янашык I—II» (у сав. пракаце «Горныя мсціўцы», 1962—63). Славацкія кінарэжысёры стварылі адметныя экранізацыі твораў П.Ілямніцкага («Неўзаранае поле», 1953, рэж. У.Багна; «Браты», 1961, рэж. А.Летрых), Я.Калінчака («Дваранскі гонар», 1957, рэж. Багна), Ф.Гечака («Драўляная вёска», 1955, рэж. Летрых), А.Чэхава («Іванаў», 1963, рэж. І.Будскі) і інш. Тэме вайны як маральнаму выпрабаванню чалавека ў востраграм. сітуацыях прысвечаны фільмы Біеліка «Сорак чатыры» (1957), «Капітан Дабач» (1959), П.Солана «Баксёр і смерць» (1969) і інш. У 1960-я г. тэматыка і жанравая палітра фільмаў пашырылася, прыйшло новае пакаленне кінематаграфістаў: С.Барабаш («Песня пра шызага голуба», 1961), І.Крэйчык («Паўночная імша», 1962) і інш. Да тэм сучаснасці, духоўных пошукаў моладзі звяртаюцца рэжысёры М.Голы («Шлях воранаў», «Справа для адваката»), Э.Грэчнер («У кожным тыдні сем дзён»), І.Медвед («Кадрыль», «Выпрабаванне кахання», «Юнацтва атамана», «Тройчы настае світанак», «Не для мяне іграюць блюз»). Ш.Угер абнаўляе кінамову, надае фільмам гукапластычную выразнасць («Было такое сяброўства», «Сонца ў сетцы», «Мы з 9 «А», «Орган»). У 1972 створаны сумесны славацка-бел. фільм «Заўтра будзе позна...» («Ян Налепка», рэж. А.Карпаў і М.Цяпак). Творчы пошук спрыяў самаідэнтыфікацыі славацкага кіно, якое звяртаецца да нац. культ. традыцый; з 1980-х г. усё больш выразна выяўляюцца яго тэматычныя і стылістычныя своеасаблівасці (рэж. Д.Ганак, З.Заган, Я.Якубіска і інш.).

Да арт. **Славакія**. Будынак Славацкага нацыянальнага тэатра.

Літ.: Краткая история Чехословакии. М., 1988; Коровицына Н. Агония социодернизации: Судьба двух поколений двух европ. наций. М., 1993; История словацкой литературы. М., 1970; История литератур западных и южных славян. М., 1997; Шумов С.А., Андреев А.Р. История Словакии, V—XX вв. М., 2000.

Ю.В.Ляшковіч (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *Л.Л.Міхайлоўская, Н.А.Царук* (гісторыя), *І.Г.Елісееў* (узброеныя сілы), *А.У.Вострыкава* (друк, радыё, тэлебачанне, літаратура, тэатр), *Я.Ф.Шунейка* (архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва), *Л.А.Шымановіч* (музыка), *В.Ф.Нячай* (кіно).

СЛА́ВАНСКАЕ РАДО́ВІШЧА НА́ФТЫ. У Светлагорскім р-не Гомельскай вобл., каля в. Славань. Адкрыта ў 1983. Распрацоўваецца з 1985. Паклады нафты пл. 2,4 км^2 прымеркаваны да міжсалявых дэвонскіх адкладаў (задонска-ялецкі гарызонт) на Пн Прыпяцкага прагіну, у Рэчыцка-Вішанскай зоне падняццяў, каля Сасноўскага, Паўд.-Сасноўскага і Зах.-Славанскага радовішчаў нафты. Нафтаносны пласт залягае на глыб. 3540—4000 м. Калектар трэшчынна-кавернава-поравы. Дэгазаваная нафта лёгкая, шчыльн. 850—862 кг/м^3, маласярністая (0,21—0,36%), парафіністая (3,8—5,4%), маласмалістая (4—8,9%). Геал. запасы нафты 6,7 млн. т, здабыта 151 тыс. т (2001). *Я.Г.Грыбік.*

СЛАВА́ЦІЧЫ, вёска ў Зэльвенскім р-не Гродзенскай вобл., на аўтадарозе Зэльва—Ружаны. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 25 км на Пд ад горада і чыг. ст. Зэльва, 153 км ад Гродна. 139 ж., 48 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — царква (канец 18 — пач. 19 ст.).

СЛАВА́ЦКАЕ НАЦЫЯНА́ЛЬНАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1944, Славацкае паўстанне 1944, узброенае антыфашысцкае паўстанне ў жн.—кастр. 1944. План выступлення распрацаваў Славацкі нац. савет (СНС), які аб'ядноўваў усе партыі і арг-цыі, што ўдзельнічалі ў руху Супраціўлення. Узбр. сілы СНС складалі партыз. брыгады (каля 15 тыс. чал.) і часці славацкай арміі, што перайшлі на бок паўстанцаў (у ходзе паўстання армія вырасла да 60 тыс. чал.). Сігналам да паўстання стала акупацыя Славакіі ням.-фаш. войскамі, якая пачалася 29.8.1944 са згоды славацкага марыянетачнага ўрада. У той жа дзень пачаліся баявыя дзеянні паўстанцаў і ўжо да 31 жн. яны кантралявалі $^2/_3$ тэр. краіны. 1.9.1944 у г. Банска-Бістрыца СНС прыняў дэкларацыю, у якой абвясціў пра шырокія дэмакр. пераўтварэнні. Створаны К-т абароны Славакіі і Гал. штаб партыз. руху. З мэтай дапамогі паўстанцам сав. ваен. камандаванне наладзіла дастаўку ім зброі, боепрыпасаў, прадуктаў, амуніцыі і інш. 8.9.1944 38-я армія 1-га Укр. фронту пачала Карпата-Дукельскую аперацыю. Наступленне разгарнулася ад г. Кросна (Польшча) на поўдзень, каб прабіцца цераз Дукельскі перавал у Славакію. Разам з сав. войскамі змагаўся сфарміраваны ў СССР 1-ы Чэхаславацкі армейскі корпус на чале з ген. Л.*Свабадам*. У паўстанні ўдзельнічалі сав. партызаны, у т.л. з Беларусі. Аднак у 2-й пал. кастр. вораг перайшоў у контрнаступленне і авалодаў асн. апорнымі пунктамі паўстанцаў, у т.л. і цэнтрам СНС г. Банска-Бістрыца. Частка паўстанцаў адышла ў горы, іх брыгады вялі баі да злучэння ў студз. 1945 з Чырв. Арміяй. С.н.п. стала пачаткам нац.-дэмакр. рэвалюцыі ў Чэхаславакіі.

СЛАВА́ЦКАЯ МО́ВА, адна са *славянскіх моў* (зах.-слав. група); мова *славакаў*, дзярж. мова *Славакіі* (да 1992 разам з *чэшскай мовай* б. Чэхаславакіі). Пашырана ў ЗША, Венгрыі, Югаславіі, Канадзе, Румыніі, Чэхіі, Польшчы і інш. Мае 3 групы дыялектаў: зах.-славацкі, цэнтр.-славацкі і ўсх.-славацкі. С.м. ўласцівы: у фанетыцы — наяўнасць кароткіх і доўгіх галосных, доўгія (за некалькімі выключэннямі) не бываюць у складах побач, кароткія галосныя чаргуюцца з доўгімі або дыфтонгамі, складаўтваральныя r, l бываюць кароткія і доўгія, v у закрытым складзе вымаўляецца як (ў), n, l, t, d перад e, і заўсёды мяккія, націск экспіраторны, на 1-м складзе; у марфалогіі — страта вынікаў палаталізацыі заднеязычных у іменным скланенні (апрача назоўнага склону мн.л.), іменных форм прыметнікаў, аорыста, імперфекта; у лексіцы шмат запазычанняў з чэш., ням. і венг. моў.

Першы ўласна славацкі помнік «Острыгамскі рытуал» (1625) напісаны на цэнтр.-славацкім дыялекце. Пісьменства на аснове лацініцы.

Літ.: Малько Р.Н. Географическая терминология чешского и словацкого языков (на общеславянском фоне). Мн., 1974; Лучыц-Федарэц І.І. Аб напісанні чэшскіх і славацкіх уласных імён па-беларуску // Бел. лінгвістыка. Мн., 1985. Вып. 27; Яго ж. Славацкае і беларускае дыялектнае словаўтварэнне // Словообразование и номинативная деривация в славянских языках. Гродно, 1986. Ч. 2. *І.І.Лучыц-Федарэц.*

СЛАВА́ЦКІ (Słowacki) Юльюш (4.9.1809, г. Крэменец Цярнопальскай вобл., Украіна — 3.4.1849), польскі паэт, драматург. Вучыўся ў Віленскім ун-це (1825—28). У 1829 пераехаў у Варшаву. З 1831 у эміграцыі (Францыя, Швейцарыя,

Грэцыя, Італія). Раннія вершы («Ода да вольнасці», «Куліг», «Песня літоўскага легіёна» і інш.) прысвечаны нац.-вызв. барацьбе. У паэмах «Гуго» (нап. 1829), «Манах», «Араб», «Ян Бялецкі» (усе нап. 1830), «Змяя» (нап. 1831) уплыў сусв. рамант. паэзіі. Праблемы тагачаснага паліт. жыцця ў цэнтры драм «Міндоўг, кароль літоўскі» (нап. 1829), «Марыя Сцюарт» (паст. 1862). Аўтар аўтабіяг. («Гадзіна роздуму»), гераічнай («Ламбро, грэчаскі паўстанец», абедзве 1833), філас.-патрыят. («Ангелі», 1838), псіхал. («Бацька зачумленых»), лірычнай («У Швейцарыі», абедзве 1839), рэаліст. («Бянёўскі», не закончана, выд. 1841) паэм. У «Паэме Пяста Дантышака... аб пекле» (1839) дантаўскія матывы. Вядомасць набылі яго рамант. драмы «Мазепа» (паст. 1847), «Баладына» (паст. 1862), «Ліля Венеда» (паст. 1863), «Фантазій» (паст. 1867), «Гарштынскі» (паст. 1879), «Кардыян» (паст. 1899), у якіх асэнсаванне канцэпцыі прыроды, гісторыі і чалавека, праблемы нац.-патрыят. руху ў Польшчы, трагедыя рамант. індывідуалізму, палеміка з А.Міцкевічам, выкарыстанне свабоднай маст. формы. Зазнаў уплыў ідэй польскага месіянізму, спрабаваў стварыць сваю філасофію духу (гісторыка-філас. паэма «Кароль-Дух», не закончана; празаічная паэма «Генезіс духу», выд. 1866; драма «Сярэбраны сон Саламеі», паст. 1900). У позняй лірыцы асабістыя пачуцці пераплятаюцца з грамадз. матывамі («Гімн», «Мой тастамент», «Адказ на «Псалмы будучыні» і інш.). На бел. мову асобныя яго творы перакладалі А.Вольскі, С.Дзяргай, У.Дубоўка, А.Звонак, М.Лужанін, П.Пестрак, Я.Семяжон, М.Танк. Паводле аднайм. драмы Дзярж. т-р оперы і балета Беларусі паставіў оперу «Мазепа» (1952), Бел. т-р імя Я.Купалы — спектакль «Смерць ваяводы» (1959).



Ю.Славацкі.

Тв.: Dzieła wszystkie. T. 1—17. Warszawa, 1952—76; Бел. пер. — Выбранае. Мн., 1959; Рус. пер. — Избр. соч. Т. 1—2. М., 1960; Избранное. М., 1984.

Літ.: Дерналович М. Юлиуш Словацкий. Варшава, 1986; Ю.Словацкий: Биобиблиогр. указ. М., 1959; Piwińska M. Juliuz Słowacki od duchów. Warszawa, 1992; Kowalczykowa A. Słowacki. Warszawa, 1994.

М.М.Хмяльніцкі.

СЛАВЕ́ЙКАЎ Петка Рачаў (29.11.1827, г. Вяліка-Тырнава, Балгарыя — 13.7.1895), балгарскі паэт, асветнік, грамадскі дзеяч. Скончыў царк. школу. Быў настаўнікам, рэдактарам газет, пасля 1878 старшыня Нар. сходу, міністр. Змагаўся за школу на балг. мове. Друкаваўся з 1843. Аўтар зб-каў вершаў і перакладаў «Стракаты букет», «Спеўнік», «Баечнік» (усе 1852). Інтымнай лірыцы і патрыят. паэзіі С. (зб. «Песні і вершы», 1879; паэмы «Крыніца Беланогай», 1873, «Кракра Пярніцкі», 1886) уласцівы нац. каларыт, рэалістычнасць. Выдаў поўны збор балг. прымавак і прыказак (1889—97). На бел. мову асобныя яго вершы пераклалі Н.Гілевіч, А.Разанаў.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1981.

СЛАВЕ́НЕ, *ільменскія славяне*, паўночныя ўсх.-слав. плямёны, якія ў 2-й пал. 1-га тыс. н.э. жылі ў басейне воз. Ільмень, у 10—13 ст. рассяляліся на Іжорскім плато, па р. Малога дасягалі Яраслаўскага Паволжа і Волга-Окскага міжрэчча. Займаліся земляробствам, паляваннем, рыбалоўствам, будавалі наземныя зрубныя дамы з печамі-каменкамі. Асн. тыпам іх пасяленняў былі селішчы. Першыя гарадзішчы ўзніклі ў 8 ст. Найб. стараж. помнікі С. — пахавальныя *сопкі* з абрадам трупаспалення. У 9—10 ст. побач з сопкамі пашыраны курганы з трупаспаленнем. З пач. 11 ст. пераважаў пахавальны абрад з трупапалажэннем. Наяўнасць у сопках фінскіх элементаў пахавальнага абраду адлюстроўвае працэс славянізацыі мясц. фіна-угорскіх плямён. Лічаць, што продкі С. рухаліся ў Прыльменне праз землі *балтаў*, у якіх запазычылі іх звычай рабіць курганныя насыпы над нябожчыкамі. Этнавызначальныя рысы С. — ромба- і авальнашчытковыя скроневыя кольцы 11—14 ст. (на Беларусі падобныя рэчы знойдзены каля *Радашковіч* і ў *Чапліне*). У 9 ст. С. і крывічы разам з фінскім племем весь утварылі паліт. саюз. Цэнтр С. — г. Ноўгарад. Землі С. сталі ядром уладанняў Наўгародскай феад. рэспублікі.

Літ.: Седов В.В. Восточные славяне в VI—XIII вв. М., 1982.

СЛАВЕ́НІЯ (Slovenija), Рэспубліка Славенія (Republika Slovenija), дзяржава на Пд цэнтр. ч. Еўропы, на ПнЗ Балканскага п-ва. Мяжуе на Пн з Аўстрыяй, на У з Венгрыяй, на Пд і ПдУ з Харватыяй, на З з Італіяй і абмываецца Трыесцкім зал. Адрыятычнага мора. Пл. 20,3 тыс. км². Нас. 1927, 6 тыс. чал. (2000). Дзярж. мова — славенская. Сталіца — г. *Любляна*. Падзяляецца на 62 раёны. Нац. свята — Дзень дзяржаўнасці (25 чэрв.).

Дзяржаўны лад. С. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1991. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт, які выбіраецца на ўсеагульных выбарах на 5 гадоў. Парламент — Дзяржаўны сход з 90 дэпутатаў, якія выбіраюцца на 4 гады. Дзяржаўны савет (у ім 40 дэпутатаў, выбіраюцца на 5 гадоў і прадстаўляюць сац., эканам., прафес. і мясц. інтарэсы) — дарадчы орган, карыстаецца правам адкладальнага вета. Вышэйшая выканаўчая ўлада належыць ураду, які самастойны ў межах сваёй кампетэнцыі і падсправаздачны Дзярж. сходу.

Прырода. С. — пераважна горная краіна. На ПнЗ і Пн хрыбты *Альпаў* (усх. ч.), у т.л. Юлійскія Альпы з г. Трыглаў (2863 м). На Пд паўн. ўскраіна *Дынарскага нагор'я*, у т.л. вапняковае плато *Карст*. Нізінныя і раўнінныя ўчасткі на З, каля ўзбярэжжа Адрыятычнага м. і на У. Ёсць радовішчы свінцова-цынкавых і медных руд, бурага вугалю і інш. Клімат на большай ч. тэр. ўмерана-кантынентальны. У міжгорных далінах т-ра студз. ад 0 °С да -2 °С, ліп. 18—19 °С. На ўзбярэжжы клімат субтрапічны міжземнаморскі. Ападкаў 800—1200 мм за год, у гарах месцамі больш за 2000 мм. Асн. рэкі — Сава і Драва (бас. Дуная). Горныя ледавіковыя і карставыя азёры. Горныя букавыя, дубовыя і хвойныя лясы займаюць каля 55% тэр., ёсць участкі са стэпавай расліннасцю (плато Карст), горныя лугі, на ўзбярэжжы міжземнаморскія хмызнякі. Жывёльны свет больш захаваўся ў гарах, там трапляюцца мядзведзі, рысі, дзікі, ваўкі, алені, серны і дзікія козы. Ёсць запаведнікі і заказнікі. Пячоры Скочыян уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

Герб і сцяг **Славеніі**.

Насельніцтва. Каля 90% складаюць славенцы. Жывуць таксама харваты (3%), сербы (2%), баснійцы-мусульмане, венгры, італьянцы і інш. Вернікі ў асн. католікі (больш за 70%), ёсць лютэране, уніяты, мусульмане. Сярэдняя шчыльн. каля 95 чал. на 1 км^2, на раўнінах і ў міжгорных далінах дасягае 200—300 чал. на 1 км^2, у гарах каля 10—20 чал. на 1 км^2. У гарадах жыве 52% насельніцтва. Найб. гарады (тыс. ж., 1996): Любляна — 330, Марыбар — 103,5, Цэле — каля 50. У прам-сці і буд-ве занята каля 45% эканамічна актыўнага насельніцтва, у сельскай гаспадарцы — 20%, у абслуговых галінах — 35%.

Да арт. **Славенія**. Падножжа Юлійскіх Альпаў на ПнЗ краіны.

Гісторыя. У старажытнасці тэр. С. насялялі *ілірыйцы*. У I ст. н.э. яе каланізавалі рымляне (значна раманізавана). З 6 ст. заселена славянамі (славенцамі). У 7 ст. яны ўтварылі княства Карантанія, якое напачатку ўваходзіла ў дзяржаву *Сама*, потым падпарадкоўвалася Баварыі (з 740—745) і Франкскай дзяржаве (з 788). Тут узніклі паселішчы ням. каланістаў (у Зах. С.), у 11—13 ст. утварыліся княствы *Карыятыя*, Штырыя, *Крайна*, Горыца, Істрыя. З 1282 яны пад уладай аўстр. Габсбургаў (канчаткова з пач. 16 ст.), тэр. ядром С. з 1394 было герцагства Крайна. У час напалеонаўскіх войнаў большая ч. С. ўваходзіла ў *Ілірыйскія правінцыі* (1809—14). Паводле рашэнняў Венскага кангрэса 1814—15 славенскія землі зноў трапілі пад уладу Аўстр. імперыі (з 1867 Аўстра-Венгрыя). Пасля 1-й сусв. вайны і распаду Аўстра-Венгрыі тэр. С. 1.12.1918 увайшла ў новастворанае Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 Югаславія). У 2-ю сусв. вайну землі С. акупіраваны ў ходзе *Балканскай кампаніі 1941* і падзелены паміж Германіяй, Італіяй і Венгрыяй. Да 15.5.1945 яны вызвалены Нар.-вызв. арміяй Югаславіі. Пасля абвяшчэння Федэратыўнай Нар. Рэспублікі Югаславіі (29.11.1945) С. ўвайшла ў яе склад як адна з 6 рэспублік (з 1963 у складзе Сацыяліст. Федэратыўнай Рэспублікі Югаславіі). Уз'яднанню тэр. С. пасля 2-й сусв. вайны садзейнічалі *Парыжскія мірныя дагаворы 1947*. С. ўносіла значны ўклад у агульнаюгасл. эканоміку. На мяжы 1980—90-х г. улады С., як і суседняй *Харватыі*, сталі ініцыятарамі выхаду сваіх рэспублік са складу югасл. федэрацыі і тым самым распаду Югаславіі. Напачатку Саюз камуністаў С. (СКС) на чале з М.*Кучанам* прапаноўваў пераўтварыць Саюз камуністаў Югаславіі (СКЮ) у саюз самаст. рэсп. арг-цый, а югасл. федэрацыю — у канфедэрацыю незалежных рэспублік. Потым Кучан узначаліў працэс супраціўлення С. югасл. федэральным уладам («раздружэнне»).

У сак. 1990 Сацыяліст. Рэспубліка С. перайменавана ў Рэспубліку С. У крас. 1990 у краіне адбыліся першыя свабодныя парламенцкія выбары, на якіх перамог саюз 7 партый «Дэмас»; прэзідэнтам С. выбраны Кучан (перавыбраны ў 1992 і 1997). 2.7.1990 парламент прыняў «Дэкларацыю аб суверэнітэце дзяржавы Славенія». На плебісцыце (праведзены 23.12.1990) 88,2% выбаршчыкаў выказаліся за дзярж. незалежнасць С. 25.6.1991 парламент прыняў акт аб незалежнасці С. (абвешчаны 26.6.1991 адначасова з Харватыяй). Паміж 27.6 і 7.7.1991 адбыліся сутыкненні паміж уведзенымі ў С. часцямі югасл. федэральнай арміі і славенскімі ўзбр. атрадамі («малая вайна»). Пры пасрэдніцтве Еўрап. супольнасцей (ЕС) і процістаянні з Харватыяй югасл. ўрад спыніў узбр. канфлікт і 29.7.1991 вывеў свае войскі з тэр. С., і яна стала незалежнай дзяржавай дэ-факта. Незалежнасць С. першымі прызналі ФРГ (26.12.1991), краіны ЕС (15.1.1992), Расія (14.2.1992). 22.5.1992 С. прынята ў ААН. 13.8.1992 дзярж. суверэнітэт С. прызнаў і югасл. ўрад (двухбаковыя дыпламат. адносіны ўстаноўлены 30.11.1995). У С. разгарнуліся паліт. і сац.-эканам. перамены. 23.12.1991 прынята канстытуцыя, паводле якой С. стала парламенцкай рэспублікай. Найб. уплывовай паліт. сілай стала ў 1992 Ліберальна-дэмакр. партыя (зноў пасля выбараў 1996), лідэр якой Я.Дрноўшак стаў прэм'ер-міністрам С. У 1994 С. далучылася да праграмы НАТО «Партнёрства дзеля міру». У 1995 парафіравана пагадненне аб асацыіраваным партнёрстве С. і Еўрап. Саюза. За гады незалежнасці С. дасягнула пэўных эканам. поспехаў, пераважна за кошт унутр. рэсурсаў. Урад краіны стымуляваў развіццё малых і сярэдніх прадпрыемстваў, заахвочваў выт-сць на экспарт. Праведзена рэформа цэнаўтварэння і эканам. лібералізацыя ў цэлым, уведзена нац. валюта (толар). С. — чл. Савета Еўропы (з 1993). Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь установлены 23.7.1992.

Да арт. **Славенія**. Горад Марыбар.

Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі. Найб. уплывовымі паліт. партыямі краіны з'яўляюцца: Ліберальна-дэмакр. партыя С., Славенская нар. партыя, С.-д. партыя С., Славенскія хрысц. дэмакраты, Аб'яднаны спіс сацыял-дэмакратаў, Дэмакр. партыя пенсіянераў, Славенская нац. партыя і інш.

Гаспадарка. С. — індустр.-агр. краіна, па ўзроўні эканам. развіцця блізкая да найб. развітых краін Зах. Еўропы. Нягледзячы на эканам. спад пасля рас-

Да арт. **Славенія**. Ландшафт паблізу г. Любляна.

паду Сацыяліст. Федэратыўнай Рэспублікі Югаславіі, нармалізавалася сітуацыя ў нар. гаспадарцы, праведзена прыватызацыя. Краіна атрымлівае штогод 1,8—2 млрд. дол. замежных інвестыцый (пераважна з Германіі, Аўстрыі, Францыі). Валавы ўнутр. прадукт у 1998 склаў 20,4 млрд. дол. (каля 10 300 дол. на 1 чал.), 35% яго атрымліваюць у прам-сці, 5% — у сельскай гаспадарцы, 60% — у сферы паслуг. У горнай прам-сці найб. значэнне мае здабыча бурага вугалю (4,6 млн. т у 1999, асн. радовішчы на Пд), свінцовых і цынкавых руд, буд. матэрыялаў. Энергетыка заснавана на выкарыстанні гідрарэсурсаў (175 ГЭС на горных рэках, у т.л. каскады ГЭС на рэках Драва, Сава, Соча), бурага вугалю і імпартнай нафты (68 ЦЭС). Працуе АЭС у Кршко (штогод выпрацоўвае каля 4 млрд. кВт·гадз электраэнергіі). У 1999 выпрацавана 13,1 млрд. кВт·гадз электраэнергіі. Шматгаліновая апрацоўчая прам-сць. Развіты чорная (у 1999 чыгуну, сталі, ферасплаваў атрымана 947 тыс. т, асн. цэнтр г. Есеніцы) і каляровая (вытв-сць свінцу, цынку, алюмінію, гарады Межыца і Кідрычава) металургія, хім. (вытв-сць мыйных сродкаў, лакафарбавых вырабаў, пластмас, пестыцыдаў і мінер. угнаенняў) і фармацэўтычная прам-сць. Развіта машынабудаванне, асабліва с.-г., электратэхн., трактара- і аўтамабілебудаванне, цяжкае машынабудаванне і інш. Аўтамабілі (118,9 тыс., 1999) выпускаюць філіялы ням. і франц. кампаній. Эл.-тэхн. прадпрыемствы выпускаюць разнастайную прадукцыю быт. (халадзільнікі, маразільнікі, пральныя машыны і інш.) і прамысл. прызначэння. Вырабляецца таксама абсталяванне для харч. прам-сці і металург. з-даў. Харч. і лёгкая прам-сць у асн. забяспечвае ўнутр. патрэбы, часткова — знешні рынак. У цэнтр. і ўсх. раёнах развіты мукамольная, маслабойная, мяса- і малочна-кансервавая, цукр. прам-сць. На Адрыятычным узбярэжжы вінаробства, вытв-сць аліўкавага алею, рыбных і фруктовых кансерваў, перапрацоўка імпартнай прадукцыі (кавы, чаю і інш.). Баваўняная, шарсцяная, шаўковая і гарбарна-абутковая прам-сць працуе пераважна на імпартнай сыравіне. Ёсць вытв-сць штучных валокнаў і скуры. У 1999 атрымана 39,1 млн. м^2 баваўняных і 4 млн. м^2 сінт. тканін. Развіты электронная, лясная і дрэваапр., папяровая, паліграф., мэблевая, швейная, шкляная і керамічная, буд. матэрыялаў прам-сць, разнастайныя самадзейныя промыслы, выраб сувеніраў і інш. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваюць каля 680 тыс. га зямлі, у т.л. каля 500 тыс. га пад ворывам і шматгадовымі насаджэннямі, каля 180 тыс. га пад пашай і лугамі. Збожжавыя культуры займаюць каля 90 тыс. га, тэхн. — 15 тыс. га, збожжа на фураж — 49 тыс. га, кармавыя травы — 292 тыс. га, пад садамі і вінаградніками — 31 тыс. га. У 1999 сабрана 117,2 тыс. т пшаніцы, 309 тыс. т кукурузы. У жывёлагадоўлі (2000) найб. значэнне мае гадоўля буйн. раг. жывёлы (453 тыс. галоў) і свінагадоўля (592 тыс. галоў). У гарах і на плато Карст гадоўля авечак і коз. Птушкагадоўля (8,55 млн. курэй, 2000). У 1999 атрымана 247 тыс. т мяса (128,6 кг на душу насельніцтва), 620 тыс. т малака (323 л на душу). Марскоe і рачное рыбалоўства. Транспарт аўтамаб., чыг., марскі. У 1999 у С. было 20,1 тыс. км аўтадарог, у т.л. з цвёрдым пакрыццём 16,3 тыс. км (619 км дарог міжнар. класа); 1201 км чыгункі. У краіне 657 тыс. легкавых, 37 тыс. грузавых аўтамашын і аўтобусаў (2000). Развіты авіяц. транспарт, каля г. Любляна — міжнар. аэрапорт. Гал. марскі порт Копер. Выкарыстоўваюцца таксама парты Трыест (Італія) і Рыека (Харватыя). У 1999 экспарт склаў 8,5 млрд. дол., імпарт 10,1 млрд. дол. У экспарце пераважае прадукцыя машынабудавання і тэкст. прам-сці (разам больш за 70% кошту), хім. (8%) і с.-г. (5%) прадукцыя; у імпарце — машыны і абсталяванне, сыравіна і паліва. Гал. гандл. партнёры: Германія (29% экспарту, 21% імпарту), Італія (15 і 17% адпаведна), Харватыя, Аўстрыя, Францыя, Расія, ЗША. С. — краіна развітога турызму і горнага спорту. Ёсць горнаклімат. і прыморскія курорты. Штогод С. наведвае больш за 1 млн. замежных грамадзян, даход ад замежнага турызму ў 1999 склаў 1,01 млрд. дол. Грашовая адзінка — талар.

Узброеныя сілы. Уключаюць рэгулярныя ўзбр. сілы (9 тыс. 550 чал.) і ваенізаваныя фарміраванні (паліцыя, 4,5 тыс. чал.). Рэзерв — 61 тыс. чал. (2000). Вярх. галоўнакамандуючы — прэзідэнт. Камплектаванне паводле прызыву. На ўзбраенні 96 танкаў, да 100 баявых браніраваных машын, каля 230 адзінак рэактыўных сістэм залпавага агню, гармат палявой артылерыі і мінамётаў, 9 пускавых установак зенітных ракет, да 60 гармат зенітнай артылерыі, каля 10 самалётаў-разведчыкаў, 18 лёгкіх трансп. самалётаў, 16 верталётаў, 2 патрульныя катэры.

Ахова здароўя. Агульнадзярж. палітыку ў галіне аховы здароўя ажыццяўляе савет па ахове здароўя. Разам з бясплатным дзярж. лячэннем існуюць страхавая медыцына, прыватныя ўрачы. Сярэдняя працягласць жыцця мужчын 72, жанчын 79 гадоў. Узровень нараджальнасці — 9 на 1 тыс. чал. Смяротнасць — 10 на 1 тыс. чал. Натуральны прырост адмоўны: — 0,05%. Дзіцячая смяротнасць — 5 на 1 тыс. чал. (2001). Забеспячэнне бальнічнымі ложкамі — 1 на 177 чал., урачамі — 1 на 866 чал. (1997).

Друк, радыё, тэлебачанне. У 1999 у С. каля 656 перыяд. выданняў. Найб. уплывовыя газеты: «Dnevnik» («Штодзённік», з 1951), «Večer» («Вечар», з 1952), «Delo» («Праца», з 1959), «Slovenske novice» («Славенскія навіны», з 1991). Інфарм. агенцтва — Славенскае тэлегр. агенцтва (СТА, з 1991). Радыё і тэлебачанне С. ў складзе прадпрыемства «Радыё і тэлебачанне Славенія». Радыёвяшчанне з 1928. Радыёстанцыя «Радыё Славенія» вядзе перадачы па 3 нац. праграмах. У 1996 зарэгістравана 59 радыёстанцый, у т.л. 19 мясц., 2 студэнцкія і камерцыйныя (найб. уплывовыя «Радыё Копер-Кападзістрыя» і «Радыё Марыбар»). Тэлебачанне з 1959 (каляровае з 1974). Цэнтр. студыя тэлебачання «Тэлебачанне Славенія» вядзе перадачы па 2 нац. каналах. Дзейнічаюць 2 рэгіянальныя каналы. З 1998 трансліруюцца праграмы па кабельным тэлебачанні і праз Інтэрнет. З 1999 працуе 41 прыватная камерцыйная, рэгіянальная і лакальная тэлевізійныя станцыі. Вяшчанне на славенскай, венг. і італьян. мовах.

Літаратура. Развіваецца на *славенскай мове*. Першы літ. твор рэліг. зместу на лацінцы — Фрэйзенгскія фрагменты (10—11 ст.). У 14—15 ст. створаны Ратацкі і Сцічанскі рукапісы, якія ўключалі малітоўныя творы, у т.л. казанні і царк. песні. У 16 ст. пад уплывам пратэстантызму абуджалася нац. свядомасць славенцаў, развівалася літ. мова (біблейскія пераклады П.Трубара, поўны пераклад Біблії Ю.Далмаціна). Пасля застою ў літ. жыцці на мяжы 18—19 ст. выйшаў першы паэт. альманах «Пісаніцы». Вылучыліся драматургія А.Т.Лінхарта, паэзія В.Водніка, аўтара першай славенскай граматыкі на славенскай мове (1811). Рамант. паэзія 19 ст. прадстаўлена творчасцю Ф.*Прашэрна*, які спалучыў дасягненні нар. паэзіі з высокім узроўнем літ. мовы. У 2-й пал. 19 ст. ўзмацніліся рэаліст. тэндэнцыі: у прозе — лірычныя і рэаліст. апісанні сял. побыту (Ф.Леўсцік, І.Юрчыч), у паэзіі — вершы І.Стрытара, С.Грэгарчыча, А.*Ашкерца*. На мяжы 19—20 ст. праявіліся шматлікія плыні і школы, у т.л. мадэрнізм і новы рамантызм з імпрэсіянізмам, дэкадансам, экспрэсіянізмам, сімвалізмам (творы І.Цанкара, О.*Жупанчыча*, С.Косавела), якія спрыялі ўздыму славенскай л-ры. У 1930-я г. найб. уплывовай плынню быў сац. рэалізм (творчасць Прэжыхава Воранца, Ю.Казака, М.*Кранеца*, С.*Касмача*). Л-ра перыяду 2-й сусв. вайны прадстаўлена партыз. лірыкай і драматургіяй М.Бора К.Дзястоўніка-Каюха, прозай Т.Свяціны. У сучаснай прозе традыцый рэалізму прытрымліваецца Б.Зупанчыч, пераемнікам мадэрнізму і новага франц. рамана з'яўляецца Р.Шаліга, да постмадэрнізму схіляецца А.Блатнік. Яскравыя прадстаўнікі жаночай прозы — Б.Баету, М.Новак. У паэзіі пераважаюць інтымнасць, двухсэнсавасць, ірацыяналізм і суб'ектыўнасць (Д.Зайц, Я.Менарт, К.Ковіч, В.Таўфер, С.Макаравіч, Т.Шаламун, Б.А.Новак, А.Дабяляк). У драматургіі значнае месца заняла творчасць Д.Янчара. У перакладзе на бел. мову выдадзены апавяданні ў зб. «Югаслаўскія апавяданні» (1975), казкі ў зб. «Югаславянскія казкі» (1999), вершы ў зб-ках «На волю птушку выпускаю» (1989), «На зорных шляхах» (1991),

«Знічкі сямі нябёс» (1992), анталогія паэзіі «Маці мая, Славенія» (1976), творы Леўсціка («Марцін Крпан», 1982), Зупанчыча («Памінкі», 1983), Жупанчыча («У вечным дазоры»), Прэжыхава Воранца («Падарункі»), Юрчыча («Як аднойчы казла судзілі: Незвычайная аповесць з даўніх часоў», усе 1986), Прашэрна («Санеты смутку», 1987). Сярод перакладчыкаў на бел. мову: Н.Гілевіч, С.Законнікаў, А.Зарыцкі, В.Зуёнак, Р.Люхцікаў, С.Мінскевіч, А.Разанаў, У.Рубанаў, К.Севярынец, Я.Сіпакоў, І.Чарота, Г.Шаранговіч і інш.

Архітэктура. З эпохі бронзы вядомы абкружаныя валамі і равамі паселішчы, некропалі з магіламі на круглых каменных падмурках. Захаваліся ўмацаваныя паселішчы ілірыйцаў, рэшткі паселішчаў кельтаў (Цэле), стараж.-рым. гарадоў (Любляна, Птуй). З 8 ст. будавалі 1-нефавыя хрысц. храмы дараманскага тыпу (падмуркі з неапрацаванага каменю, плоскія драўляныя дахі). У 12—13 ст. панаваў манум. раманскі стыль, будавалі кляштарныя комплексы з 3-нефавымі базілікамі (у Сцічне, 1136—56; Кастаневіцы), 1-нефавыя касцёлы і ратонды (баптыстэрый у Коперы), касцёлы са шматграннай апсідай (у Сподня-Муце), невял. замкі з палацам, капэлай і данжонам (у Хмельніку каля Нова-Места). Гар. паселішчы, што выраслі на месцы ант. (Любляна, Птуй, Цэле), захоўвалі іх рэгулярную планіроўку. У 13 ст. з'явіліся гатычныя арх. элементы, раслі ўмацаваныя гарады. У цэнтр. ч. С. пераважалі 2-павярховыя дамы з вузкімі фасадамі, на ўзбярэжжы Адрыятыкі — 3-павярховыя палацы з парадным заламі і стральчатымі аконнымі праёмамі (у Коперы, Піране і інш.). У культавым буд-ве стаў пашыраным тып 3-нефавага касцёла (касцёл Маці Божай у с. Птуйска-Гора каля Птуя); сустракаліся 2-нефавыя зальныя касцёлы з вежай на фасадзе (у Свеці-Прымажы-над-Камнікам, каля 1459—1507) і 1-нефавыя з плоскай столлю і шматграннай скляпеністай апсідай. Саборы вызначаліся строгім вонкавым выглядам, акцэнтаваліся шмат'яруснымі квадратнымі вежамі з шатровым завяршэннем (у Марцьнцы, каля 1392; Солчаве, 1461—85); іх убранне стала больш дэкаратыўным, сеткавыя і зорчатыя скляпенні пакрывалі маляўнічай арнаментацыяй (у Шэнт-Руперце, каля 1482—97). У свецкай архітэктуры 16 ст. з'явіліся рэнесансавыя элементы — балконы, лоджыі, арачныя галерэі, ордэрныя парталы (ратуша і замак у Марыбары; замкі Тур'як і Жужамберк, палац «Старая графовія» ў Цэле). У пач. 17 ст. пашырыўся стыль барока. Формы італьян. і аўстр. дойлідства спалучаліся з мясц. асаблівасцямі. Касцёлы ўзводзілі 1-нефавыя з прадстаўнічым фасадам (касцёл св. Якаба, 1613—15; сабор св. Мікалая, 1700—07; урсулінак, 1718—26, 1744, гал. алтар маст. Ф.Роба, у Любляне), у плане трохвугольныя (у Шмарна-Горы, 1711—12), авальныя (у Паляне, 1720, арх. абодвух Г.Мачак) ці з увагнутым 2-вежавым фасадам (у Сладка-Горы, каля 1750). З 19 ст. ўсталяваўся класіцызм, з'явіліся элементы гістарызму (неагатычная ратуша ў Птуі, неарэнесансавы Нац. музей у Любляне) і стыль мадэрн (творы арх. М.Фабіяні ў Любляне). 1920-я г. адзначаны пошукамі ў стылі нац. неарамантызму з выкарыстаннем сярэдневяковай, рэнесансавабарочнай спадчыны, нар. архітэктуры (б-ка ун-та ў Любляне, арх. І.*Плечнік*, дзейнасць якога заклала аснову славенскай арх. школы 20 ст.). У 1930-я г. вы-



Да арт. **Славенія**. Від горада Любляна.

явілася тэндэнцыя да функцыяналізму (арх. І.Вурнік, В.Шубіц у Любляне, Марыбары). Вял. урбаністычныя праекты канструктывізму рэалізоўваліся з рэгіянальнымі адметнасцямі: выкарыстанне разам з бетонам мясц. парод каменю, цэглы, дрэва, арганічнае ўпісанне архітэктуры ў горны ландшафт, пашырэнне 8-павярховых «кропачных» і вежападобных дамоў «стоўпніц». Пасля 2-й сусв. вайны ўзведзены новыя гарады з выразнай свабоднай планіроўкай, прамысл. раёны, добраўпарадкаваныя жылыя комплексы з грамадскімі цэнтрамі, школамі і інш. Паводле праектаў арх. Фабіяні і Плечніка рэканструяваны плошчы і набярэжныя Любляны. Сярод найб. значных пабудоў 2-й пал. 20 ст.: Нар. скупшчына (арх. В.Гланц), спарт. зала «Цівалі» (арх. М.Божыч), ансамбль будынкаў на пл. Рэвалюцыі (арх. Э.Раў-нікар) у Любляне, атэль «Рыўера» у Петравіцы (арх. І.Арнаўтавіч), комплекс вакзала і атэля «Славія» ў Марыбары (арх. М.Чэрнігай), работы арх. В.Мушыча, С.Севеча, М.Міхеліча і інш. У 1959 засн. Саюз архітэктараў С.

Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. На тэр. С. выяўлены дробная пластыка эпохі палеаліту, неалітычная кераміка з геам. арнаментам, бліз-

Да арт. **Славенія**. Галоўны алтар касцёла урсулінак у Любляне. Мастак Ф.Роба.

Да арт. **Славенія**. Касцёл урсулінак у Любляне.

кая да помнікаў Апуліі і Сіцыліі, творы выяўл. і дэкар.-прыкладнога мастацтва ілірыйцаў (бронзавыя пасудзіны-сітулы з рэльефнымі культавымі і быт. сцэнамі). Да 4—7 ст. адносяцца маст. вырабы гатаў і стараж. славян. У сярэдневякоўі пашыраны рэльефы ў тымпанах, з'явіліся алтары са статуямі і рэльефамі, драўляная скульптура («Божая Маці», 3-я чвэрць 14 ст., царква ў Солчаве). Асобным творам скульптуры 13—14 ст. уласцівы прыальпійскія і паўн.-італьян. ўплывы. Лінейна-плоскасны стыль размалёвак 1-й пал. 14 ст. (у Турнішчы, у Свеці-Янезе на Бохінскім воз.) пад італьян. уплывам змяніўся больш аб'ёмнымі выявамі з наіўнай непасрэднасцю (у Марцьянцы, 1392, майстар Янез Аквіла). Лірызмам, цікавасцю да пейзажу, быт. дэталей, простанар. вобразаў вылучаюцца размалёўкі Янеза Люблянскага ў Вісака (1443) і Муляве (1456). Евангельскія сцэны часта ствараліся ў выглядзе сцэн з сял. жыцця (размалёўкі касцёла ў Цргробе, 1453, майстар Вольбенк). Рысы Адраджэння праяўляліся ў разных алтарах, рэльефных эпітафіях, найб. у размалёўках касцёлаў у Крыжна-Горы (1502) і Свеці-Прымажы-над-Камнікам (1504 і каля 1520), у якіх спалучаліся жывая характэрнасць вобразаў і шматлікасць быт. дэталей. Пад венецыянскім уплывам у канцы 16 ст. ўзніклі свецкія жанры — партрэт і дэкар. жывапіс. У скульптуры вылучаюцца пластычна-выразныя і дынамічныя работы Ф.Робы, у жывапісе — ілюзіяністычныя размалёўкі і алтарныя карціны Ф.Ялоўшака, партрэты Ф.Берганта. У дэкар.-прыкладным мастацтве пашыранымі сталі вырабы з металу, дрэва, керамікі. У выяўл. мастацтве класіцызм суіснаваў з рамантызмам (творы Ф.Каўчыча, М.Лангуса). У жанрава-партрэтных кампазіцыях І.Томінца рамант. ноты спалучаліся з рысамі *бідэрмееру*. У канцы 19 ст. ў стылістыцы позняга класіцызму жывапісныя кампазіцыі ствараліся А.Ажбе, А.Гангл, І.Заец, А.Карынгер, браты Ю. і Я. Шубіцы, у якіх рысы акадэмізму саступілі месца пленэрным пошукам. У пач. 20 ст. склаўся славенскі імпрэсіянізм (нац. пейзажы часта са сцэнамі сял. працы І.Грохара, М.Стэрнена, М.Ямы, Р.Якапіча). Жывапісцы і графікі І.Ваўпаціч, Х.Смрэкар, Ф.Тратнік у пошуках нац. своеасаблівасці звярталіся да сімволікі і стылізацыі. Цікавасць да сял. жыцця, драм. выразнасць, часам сац.-крытычныя ноты ўласцівы творчасці экспрэсіяністаў Ф. і Т.Краляў, В.Пілана, Тратніка. У 1920—30-я г. побач з экспрэсіянізмам і сюррэалізмам (С.Крэгар) развіваўся т. зв. паэтычны рэалізм: вытанчаныя па каларыце інтымныя і лірычныя жанравыя сцэны, партрэты, пейзажы Б.Якаца, Г.А.Коса, Ф.Міхеліча і інш., якія выкарыстоўвалі прыёмы постімпрэсіянізму. У скульптуры пад уплывам І.Мештравіча неакласічная манументальнасць спалучалася з дэкар. стылізацыяй. З 1950-х г. мастакі звяртаюцца да фармальна-фактурных і колеравых пошукаў: жывапіс і графіка Я.Берніка, Г.Ступіцы, скульптура Я.Савіншака, С.Ціхеца. Нац. рэаліст. і гуманіст. традыцыі развівалі Кос, Міхеліч, Якац, Л.Далінар. Развіваецца манум. мастацтва (мазаікі М.Прэгеля, вітражы Крэгара), маст. канструяванне.

Музыка. Муз. фальклор С. падзяляецца на прыморска-істарскі, альпійскі і меджымурскі (усх. ч.). Бытуюць лірычныя, жартаўлівыя, шлюбныя песні, стараж. балады. Нар. песні і танцы маюць агульныя рысы з ням.-аўстр. і венг. нар. музыкай. У альпійскіх, прыморскіх і ўсх. рэгіёнах пашыраны шматгалосыя спевы, у паўд.-ўсх. — аднагалосыя абрадавыя песні, т.зв. каледы. Нар. музыка дыятанічная, для яе характэрны скачкі на шырокія інтэрвалы, пераменны метр, складаны рытм. Сярод муз. інструментаў пераважаюць духавыя — фрулы, рог, губны гармонік. Прафес. музыка развіваецца з 12—13 ст. Сярод кампазітараў 15—16 ст. Б.Праспергіус, Ю.Слатканя, Я.Галус (царк. і свецкае шматгалоссе). З 2-й пал. 16 — пач. 17 ст. актывізавалася муз. жыццё ў гарадах. У 1701 Я.Хёфер засн. у Любляне Філарманічную акадэмію (адна са старэйшых у Еўропе, з 1794 —Філарманічнае т-ва). Сярод кампазітараў 18 ст. Я.Зупан (аўтар першай оперы на славенскай мове «Белін», 1780 ці 1782, не паст.), Я.Новак, М.Омерза, Хёфер, Я.Хочавар, М.Чадзеж. Рысы нац. стылю, пераважна ў песенна-харавым жанры, усталяваліся да сярэдзіны 19 ст. (Ю.Флейшман, М.Вілхар, Г. і К. Машакавы). Пры муз. т-ве «Глазбена маціца» ў Любляне (з 1872) засн. муз. школа (1882), хор (1891), сімф. аркестр. У 1892 адкрыты Славенскі т-р (ставіліся нац. оперы і аперэты), пры ім — Славенская опера. У канцы 19 — пач. 20 ст. нац. муз. мастацтва развівалі Ф.Гербіч, А.Фёрстэр, у пач. 20 ст. — Г.Крэк, Э.Адаміч, Р.Савін, А.Лаявіц. У 1919 адкрыта Люблянская кансерваторыя (з 1926 Дзярж. кансерваторыя, з 1939 Муз. акадэмія, з 1945 Вышэйшая муз. школа), у 1934 — Ін-т фальклору, у 1935 — Люблянская філармонія. Пачынальнік сучаснай нац. кампазітарскай школы С.Осцерц (прыхільнік зах.-еўрап. музыкі). Да нац. вытокаў звярталіся Б.Арніч (сімф. творы), М.Казіна, Д.Швара, П.Шывіц, М.Ліпаўшак. Пасля 2-й сусв. вайны развіццю муз. культуры С. садзейнічалі: кампазітары І.Петрыч, П.Рамаўш, Швара; дырыжоры Д.Жэбрэ, Б.Лескавіц, С.Хубад, З.Цыгліч; піяністы Ліпаўшак, Шывіц; скрыпач І.Озім; спевакі В.Букавец, Л.Корашац, Ф.Лупша, Р.Францл, Х.Хелцл; музыказнаўцы А.Рыявец, Д.Цветка і інш. Працуюць Ін-т музыказнаўства пры Люблянскім ун-це, Славенская філармонія, сімф. і камерны аркестры, аркестр лёгкай музыкі пры радыё і тэлебачанні, Люблянскі камерны хор, Славенскі актэт, «Актэт Галус» у Любляне і інш. З 1950 дзейнічае Саюз кампазітараў С.

Тэатр. Першыя тэатр. прадстаўленні паказаны ў пач. 17 ст. ў Любляне ў гімназіі езуітаў. У 17—18 ст. адбываліся лац. і ням. містэрыі. Першае славенскае прадстаўленне, створанае манахам Ромуальдам, пастаўлена ў 1721. У 1765 у Любляне адкрыўся пастаянны Саслоўны т-р (з 1862 — Дзярж. т-р), у якім у 1789 пастаўлена першая славенская п'еса «Міцка — дачка жупана» А.Лінхарта. У 2-й пал. 19 ст. ствараліся аматарскія гурткі пры славенскіх чытальнях. У 1867 арганізавана Тэатр. т-ва ў Любляне, пры якім працавала драм. школа. Драм. т-вы існавалі таксама ў Трыесце (1902), Марыбары (1909), Цэле (1911), Птуі (1912). У 1892 у Любляне засн. першы прафес. Славенскі нац. т-р, дзе ставілі п'есы класічнай драматургіі і нац. аўтараў (І.Цанкар, Э.Крыстан, Ф.Фіжгар). На яго сцэне працавала першае пакаленне славенскіх акцёраў: І.Борштнік, С.Борштнік-Звонарава, А.Даніла-Цэрар, А.Данілава, Л.Дрэнавац, Х.Нучыч, М.Скрбіншак. Паміж сусв. войнамі нанава сфарміравана трупа Славенскага нац. т-ра (акцёры М.Вера, М.Данілава, І.Левар, Скрбіншак, рэжысёры Ц.Дзебевец, Б.Гавела, Б.Крэфт, Б.Ступіца, О.Шэст), засн. т-р у Марыбары. У 1945 дзейнасць гэтых т-раў аднаўлена, створаны новыя тэатр. калектывы, у т.л. Гарадскі т-р у Любляне. З 1950-х г. ствараліся эксперым. т-ры, якія аддавалі перавагу драме абсурду. У 1970-я г. распачалі дзейнасць шматлікія авангардысцкія калектывы («Глей», «Пекарна» ў Любляне). Існуе больш за 10 прафес. т-раў, працуюць таксама аматарскія калектывы; асн. цэнтры тэатр. жыцця — Любляна, Марыбар, Цэле, Нова-Горыца. Працуюць акцёры П.Бабіч, Ш.Дрольц, Д.Почкай, Р.Роліч, В.Юван; рэжысёры М.Корун, З.Шэдлбаўэр, Д.Іованавіч і інш. З 1945 у Любляне працуюць Акадэмія тэатр. мастацтва, Славенскі тэатр. музей.

Н.А.Сцепанюга (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *М.С.Даўгяла* (гісторыя), *І.Г.Елісееў* (узброеныя сілы), *С.Торкар* (друк, радыё, тэлебачанне), *І.У.Кур'ян* (літаратура), *Я.Ф.Шунейка* (архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва), *Л.А.Шымановіч* (музыка).

СЛАВЕ́НСКАЯ МО́ВА, адна са *славянскіх моў* (паўд.-слав. група); мова *славенцаў*; афіц. мова *Славеніі*. Пашырана ў Італіі, Аўстрыі, ЗША. Мае 49 дыялектаў, якія аб'ядноўваюцца ў 7 дыялектных груп: панонская, штырыйская, карынтыйская, верхнекраінская («гарэньская»), ніжнекраінская («даленьская»), роўтарская, прыморская; да ліку цікавых і арыгінальных належыць дыялект Рэзіі на тэр. Італіі, на базе якога ёсць спробы стварыць літ. мікрамову. С.м. ўласцівы: у фанетыцы — складаная сістэма галосных, дзе проціпастаўляюцца доўгія і кароткія гукі, якія дыферэнцыруюцца ў залежнасці ад націску; спецыфічны поўнагалосны ее, ээ (транскрыбіруецца як перавернутае е:э) неўласцівы інш. сучасным мовам, але падобны да праслав. рэдукаванага; у марфалогіі — шмат архаічных рысаў, у

т.л. разгорнутая сістэма скланення; дзе захаваліся формы падвойнага ліку; форма супіна ў дзеясловаў, якая перадае намер што-небудзь зрабіць; некат. формы прошлага часу (перфект, плюсквамперфект) і інш. На дыялектным узроўні выяўляюцца шматлікія супадзенні паміж значнымі масівамі і асобнымі групамі славенскіх і бел. гаворак: пераход ненаціскнога о у а, пераход l у u і інш.

Пісьменства з 10—11 ст. (Фрэйзінгенскія ўрыўкі). Пачатак літ. С.м. звязаны з пратэстантызмам, дзейнасцю Прымажа Трубара, які перакладаў багаслужэбныя кнігі на даленьскі дыялект (аснова літ. мовы). Пісьменства на аснове лацініцы.

Літ.: Мечковская Н.Б. Словенский язык. Мн., 1991; Цыхун Г. Аб славенска-беларускіх моўных сыходжаннях // III. Nemzetközi szlavisztikai napok. Szombathely, 1988; Яго ж. Да беларуска-славенскіх дачыненняў (гістарычна-моўная праблематыка) // Беларуская мова: шляхі развіцця, кантакты, перспектывы. Мн., 2001. *Г.А.Цыхун.*

СЛАВЕ́НСКІ [Slavenski; сапр. Штольцар (Štolcer)] Іосіп (11.5.1896, г. Чакавец, Харватыя — 30.11.1955), югаслаўскі кампазітар; адзін з заснавальнікаў сучаснай нац. кампазітарскай школы. Вучань З.*Кодая* і В.*Новака*. У 1925—26 удасканальваў майстэрства ў Парыжы. Працаваў у Бялградзе, з 1949 праф. Муз. акадэміі. Для творчасці характэрны ўвасабленне фалькл. матываў у розных муз. жанрах, выкарыстанне сучаснай тэхнікі пісьма. Зазнаў уплывы франц. імпрэсіяністаў. Сярод твораў: «Усходняя сімфонія» («Рэлігіяфанія») для салістаў, хору і арк. (1934); кантаты; сімфонія з хорам «Сімфанічны эпас» (1945), сімф. сюіта Балканафанія (1927), 4 балканскія танцы і інш. для арк.; Слав. саната для скр. з фп. (1924); камерна-інстр. ансамблі, фп. творы, у т.л. «Танцы і песні з Балкан»; хары, песні і інш.

СЛАВЕ́НЦЫ (саманазва словенці), народ, асн. насельніцтва *Славеніі*. Агульная колькасць 2,3 млн. чал. (1992). З іх у Славеніі 1,7 млн. чал. Гавораць на *славенскай мове*. Вернікі — католікі, ёсць пратэстанты і праваслаўныя.

СЛАВЕ́ЧНА, рака на тэр. Украіны і Беларусі, правы прыток р. Прыпяць. Даўж. 158 км, пл. вадазбору 3600 км^2 (у межах Беларусі адпаведна 109 км і 3000 км^2). Пачынаецца за 3 км на ПдЗ ад в. Антонавічы Оўруцкага р-на Жытомірскай вобл. (Украіна), вусце за 3 км на ПнУ ад в. Вяжышча Нараўлянскага р-на Гомельскай вобл. У вярхоўі цячэ ў межах Оўруцкага кража, далей па забалочанай раўніне Мазырскага Палесся. Асн. прытокі: Ясенец, Жалонь (справа), Батыўля, Чэрцень (злева). Даліна трапецападобная, ніжэй в. Цешкаў Нараўлянскага р-на зліваецца з поймай р. Прыпяць; пераважная шыр. 700—1000 м, на некат. участках у сярэднім цячэнні да 2,5 км. Схілы ў верхнім цячэнні часцей умерана стромкія, моцна перасечаныя ярамі, ніжэй спадзістыя, слабапарэзаныя, выш. 2—5 м. Пойма двухбаковая, часцей забалочаная, шыр. 400—700 м, у ніжнім цячэнні да 2 км, у сярэднім і ніжнім цячэнні перасечаная старымі рэчышчамі і меліярац. каналамі. Рэчышча звілістае, на значным участку ў сярэднім цячэнні моцназвілістае, шыр. 2—8 м, у вярхоўі шмат камянёў і валуноў, на астатнім працягу пераважна разгалінаванае (з невялікімі пясчанымі астравамі, якія ў разводдзе затапляюцца), у некат. месцах у верхнім цячэнні на тэр. Украіны часткова каналізаванае. Берагі стромкія і абрывістыя, у нізоўі спадзістыя. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Веснавое разводдзе з сярэдзіны сак. да канца крас., найвыш. — у канцы сак.—пач. крас.; сярэдняя выш. над межанным узроўнем 2,3 м, у ніжнім цячэнні 1,8 м. Замярзае ў канцы снеж., крыгалом у сярэдзіне сакавіка. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 13,7 м^3/с. У С. па Свячанскім каналe паступае частка сцёку з р. Жалонь. С. — водапрыёмнік меліярац. сістэм. На рацэ каля в. Славечна плаціна. У вадазборы С. наліўныя вадасх. Загацце і Свяча. Ніжняе цячэнне ракі ў зоне адсялення з-за радыяцыйнага забруджвання. *А.А.Макарэвіч.*

СЛА́ВІН Леў Ісаевіч (27.10.1896, г. Адэса, Украіна — 6.9.1984), рускі пісьменнік. Друкаваўся з 1922. У п'есе «Інтэрвенцыя» (паст. 1933) паслярэв. Адэса. Раман «Ардэнскія страсці» (1976) пра 2-ю сусв. вайну. Аўтар рамана «Спадчыннік» (1930), аповесцей «Мае землякі» (1942, экранізавана пад назвай «Два байцы», 1943), «З другога боку ўзгорка» (1958), «За нашу і вашу свабоду! Аповесць пра Яраслава Дамброўскага» (1968), «Утрапёны. Аповесць пра Віскарыёна Бялінскага» (1973), апавяданняў, нарысаў, кніг мемуараў «Партрэты і нататкі» (1965), «Мой пачуццёвы сябар» (1973), кінасцэнарыяў. П'еса «Інтэрвенцыя» паст. ў Дзярж. рус. драм. т-ры Беларусі (1940).

Тв.: Избр. произв. Т. 1—2. М., 1981; Ударивший в колокол: Повесть об А.Герцене. 3 изд. М., 1986; Арденнские страсти: Роман, портреты, зап. М., 1987; Наследник. М., 1990.

Літ.: Гордон А. Лев Славин и его пьеса «Интервенция». Душанбе, 1966; Язык и стиль произведений В.П.Катаева, К.Г.Паустовского и Л.И.Славина: Сб. науч. тр. Одесса, 1987..

СЛАВІНЕ́ЦКІ Епіфаній (?—20.11.1657), рускі філолаг-педагог, пісьменнік, перакладчык. Паводле некат. звестак, ураджэнец Беларусі. Вучыўся, верагодна, у Кіеўскай брацкай школе (да 1632) і за мяжой. З 1639 выкладаў у Кіева-Магілянскім калегіуме, з 1649 у манастырскай школе ў Маскве. Аўтар трактата на рус. мове «Грамадзянства звычаяў дзіцячых» (апубл. 1919) пра свецкае выхаванне дзяцей. Падтрымліваў ідэю Сімяона Полацкага пра адкрыццё вышэйшай школы ў Маскве, быў прыхільнікам пашырэння школьнай адукацыі. Напісаў шэраг прадмоў да царк. кніг, 50 пропаведзей, прысвечаных тагачасным грамадска-паліт. і маральным праблемам. Перакладаў царк.-багаслоўскія творы Іаана Златавуста, Грыгорыя Багаслова, Іаана Дамаскіна, а таксама кнігі па медыцыне, геаграфіі, гісторыі і інш. Аўтар прац «Лексіконъ латинский з Калепина преложенный, на славенский», «Лексікон словеналатинскій» (разам з А.Карэцкім-Сатаноўскім), «Книга лѣксиконъ греко-славено-латинский», у якіх выкарыстоўваў элементы жывых слав. моў, у т.л. бел. лексіку. Яму належаць тлумачэнні тэрмінаў Свяшчэннага пісання (т. зв. «Філалагічны слоўнік»).

В.Ф.Шалькевіч.

СЛАВІ́НСКІ (сапр. Качароўскі) Адам Сямёнавіч (11.9.1885, г.п. Панінка Палонскага р-на Хмяльніцкай вобл., Украіна — 1937), удзельнік рэв. руху ў Польшчы, Расіі і Беларусі, парт. і дзярж. дзеяч БССР. З 1907 чл. Варшаўскай арг-цыі СДКПіЛ. У 1907 і 1909 быў арыштаваны. З 1912 у Пецярбургу, дзе ў час Лют. рэвалюцыі 1917 узначальваў чырвонагвардзейскі атрад, потым Чырв. гвардыю Маскоўска-Застаўскага р-на Петраграда. Удзельнік Кастр. рэвалюцыі 1917 у Петраградзе. Са студз. 1918 у Мінску, старшыня бюро Мінскай групы СДКПіЛ. У час ням. акупацыі Беларусі чл. Мінскага падп. райкома РКП(б), са жн. 1918 чл. краявога к-та камуніст. арг-цый Беларусі і Літвы. Са снеж. 1918 нач. Мінскай гар. міліцыі, заг. Мінскага губ. аддзела ўпраўлення ўнутр. спраў, чл. Мінскага губ. ВРК. З лют. 1919 камісар 52-й (Зах.) стралк. дывізіі. У пач. 1920 арганізатар партыз. руху ў Мінскай губ., з мая 1920 нач. палітаддзела 57-й стралк. дывізіі, у ліп.—жн. 1920 старшыня Гродзенскага РВК. З 1921 нарком земляробства БССР, у 1924—28 прадстаўнік КПЗБ пры ЦК КП(б)Б, узначальваў Бюро дапамогі Кампартыі Зах. Беларусі пры ЦК КП(б)Б. У 1928—30 сакратар Мінскага акр. і гар. к-таў КП(б)Б, адначасова старшыня МОПРа БССР. У 1934—37 нач. палітаддзела Маск.-Бел.-Балт. чыгункі. Чл. ЦБ КП(б)Б у 1920—24, чл. ЦК КП(б)Б у 1925—32, чл. ЦК КПЗБ у 1926—35, чл. ЦК КПП з 1930, чл. ЦВК СССР у 1925—29, чл. ЦВК БССР у 1920—31, чл. Прэзідыума ЦВК БССР у 1922—24. 9.7.1937 арыштаваны, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1955.

А.Ф.Хацкевіч.

СЛАВІ́НСКІ Пётр (10.7.1795, в. Кена Віленскага пав. — 30.6.1881), расійскі астраном і педагог. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1826). Д-р філасофіі (1817), праф. (1826). Скончыў Віленскі ун-т (1815), дзе і працаваў у 1818—19 і 1823—32. У 1820—22 удасканальваў адукацыю ў Парыжы. У 1825—43 дырэктар *Віленскай астранамічнай абсерваторыі*. Навук. працы па назіральнай астраноміі, вывучэнні руху астэроідаў, планет і Месяца. Удзельнічаў у правядзенні астранома-геадэзічных вымярэнняў у Літве, Беларусі і Курляндыі. Аў-

тар падручніка «Асновы тэарэтычнай і практычнай астраноміі» (1826).

Літ.: Библиография русской астрономической литературы 1800—1900 гг. М., 1968 (Тр. Гос. астроном. ин-та. Т. 37); Матулайтите С.П. Астрономия в Вильнюсском университете во II половине XVIII в. — в начале XIX в. // Тр. АН Литовской ССР. Сер. А. 1969. Т. 1. *А.І.Болсун.*

П.Славінскі.

СЛАВІ́СТАЎ БЕЛАРУ́СКІ КАМІТЭ́Т (БКС), навуковая арганізацыя пры Нац. АН Беларусі, прызначаная развіваць і каардынаваць даследаванні ў галіне *славяназнаўства* на Беларусі, садзейнічаць навук. сувязям бел. славістаў са славістамі інш. краін.

Засн. ў 1957 як арганізац. к-т для падрыхтоўкі да IV Міжнар. з'езда славістаў у Маскве. У 1959 ператвораны ў пастаянна дзейны Бел. к-т славістаў, які функцыянуе ў адпаведнасці са статутам Міжнар. к-та славістаў (гл. *Славістаў міжнародны камітэт*). С.б.к. удзельнічае ў выпрацоўцы праблематыкі чарговых з'ездаў, уносіць прапановы па іх правядзенні, прапануе тэмы дакладаў ад Беларусі, садзейнічае іх своечасовай падрыхтоўцы і публікацыі, клапоціцца пра належнае прадстаўніцтва бел. славістыкі на з'ездзе і ў міжнар. камісіях. Прымае ўдзел у арганізацыі на Беларусі канферэнцый, сімпозіумаў і інш. мерапрыемстваў, прысвечаных вывучэнню мовы, л-ры, духоўнай і матэрыяльнай культуры слав. народаў, у першую чаргу беларусаў у іх сувязях з інш. славянамі, падтрымлівае кантакты з замежнымі славістамі, якія займаюцца бел. праблематыкай, арганізоўвае абмен л-рай, удзельнічае ў падрыхтоўцы кніжных выставак у час міжнар. з'ездаў славістаў, каб паказаць дасягненні бел. вучоных у галіне славяназнаўства і беларусістыкі. Старшыні С.б.к.: П.Ф.Глебка (з 1957), М.Р.Суднік (з 1959), А.І.Жураўскі (з 1985), І.Я.Навуменка (з 1990). *Г.А.Цыхун.*

СЛАВІ́СТАЎ МІЖНАРО́ДНЫ КАМІТЭ́Т (МКС), выканаўчы орган міжнар. аб'яднання славістаў. Мае на мэце наладжванне міжнар. супрацоўніцтва славістаў для спрыяння развіццю навук пра слав. мовы і л-ры, вывучэнню гісторыі і культуры слав. народаў.

Засн. ў 1955 у г. Бялград на Міжнар. нарадзе славістаў. У складзе к-та 37 краін (2001): усе слав. краіны і некат. неслав., дзе вядзецца навук. праца ў галіне *славяназнаўства* (Вялікабрытанія, Аўстрыя, Германія, Італія, ЗША, Францыя і інш.). Ад Беларусі ў к-т уваходзілі К.Крапіва, М.Р.Суднік, уваходзіць Г.А.Цыхун (гл. *Славістаў беларускі камітэт*). С.м.к. узначальвае старшыня, які выбіраецца на 5 гадоў ад краіны, дзе адбудзецца чарговы з'езд. Пры к-це дзейнічае 28 камісій (агульнаслав. лінгвістычнага атласа, выдавецка-тэксталагічная, лінгвістычнай бібліяграфіі, сацыялінгвістыкі, транскрыпцыйная, словаўтварэння, слав. фразеалогіі, слав. літ. моў, археалагічная, лексікалогіі і лексікаграфіі, слав. паэтыкі і стылістыкі, слоўніка стараслав. мовы і гісторыі славістыкі, слав. анамастыкі, грамат. будовы слав. моў і інш.), якія каардынуюць працу славістаў па сваім профілі ў міжнар. маштабе. Праз кожныя 5 гадоў С.м.к. склікае ў слав. краінах Міжнар. з'езды славістаў (адбылося 12 з'ездаў; апошні ў Польшчы, 1998). Паміж з'ездамі праходзяць пленарныя пасяджэнні, на якіх разглядаюцца навук. праблематыка чарговага з'езда, яго праграма, структура і колькасны склад, абмяркоўваецца дзейнасць навук. камісій, выданне прац з'езда і інш. *Г.А.Цыхун.*

СЛАВІ́СТЫКА, тое, што *славяназнаўства*.

СЛАВІ́СТЫКІ ІНСТЫТУ́Т ПО́ЛЬСКАЙ АКАДЭ́МІІ НАВУ́К (Instytut Slawistyki PAN). Створаны ў 1954 у Варшаве як Ін-т славяназнаўства Польскай АН на базе Мовазнаўчай камісіі Акадэміі ведаў. З 1992 сучасная назва. Асн. кірункі даследаванняў: гісторыя славянства і літ. слав. моў, развіццё слав. гаворак. Мае аддзелы: беларусістыкі, русістыкі, украіністыкі, чэшскай і славацкай, праслав. моў, слав. анамастыкі, агульнай славістыкі, слав. л-р і інш. Разам з К-там мовазнаўства выдае квартальнік «Slavia Orientalis», штогоднікі «Rocznik Slawistyczny» («Славяназнаўчы штогоднік»), «Studia z Filologii Polskiej i Słowianskej» («Даследаванні з філалогіі польскай і славянскай»), «Pamętnik Słowiański» («Славянскія нататкі»), «Biuletyn Slawistyczny» («Славяназнаўчы бюлетэнь») і інш. Мае філіялы ў Кракаве, Познані, Гданьску. Сумесна з Інтам мовазнаўства АН Беларусі ў 1960-я г. праводзіў даследаванні польскіх рэгіянальных гаворак на Палессі, сімпозіумы па бел.-балта-слав. ізалексах. Да 1986 і з 1992 сумесна апрацоўваецца славістычная бібліяграфія, якая выдаецца ін-там. Выдадзены «Падручны польска-беларускі слоўнік» пад рэдакцыяй М.Бірылы і А.Абрэмбскай-Яблонскай (1962), «Беларуска-польскі фразеалагічны слоўнік» А.Аксамітава і М.Чурак (2000), кн. «Беларуская думка XX ст.: Філасофія, рэлігія, культура (Анталогія)» (1998). *І.У.Кур'ян.*

СЛА́ВІЧАК (Slaviček), сям'я чэшскіх жывапісцаў, бацька і сын; прадстаўнікі чэш. нац. школы рэаліст. пейзажа. Нарадзіліся ў Празе.

Антанін (16.5.1870—1.2.1910). Вучыўся ў Пражскай АМ (1887—91 і 1894—97). У 1907 наведаў Германію і Францыю, у 1909 Югаславію. Пейзажам уласцівы лірыка-эпічны характар: «Дарога ў час дажджу» (1895), «Восень у тумане» (1897), «Чэрвеньскі дзень» (1898), «У нас у Каменічках» (1904), «Элішкін мост» (1906), «Сабор св. Віта ў Празе» (1908—09), «Овенецкая вуліца ў раёне Бубенеч» (1909). Ян (22.1.1900—5.4.1970). Вучыўся ў Пражскай АМ (1916—25) у Я.Прэйслера, М.Швабінскага. У 1920—50 наведваў Францыю, Італію, Іспанію, Грэцыю. Член т-ва мастакоў «Манес» (з 1925). Працаваў у жанрах пейзажа і нацюрморта: «Нацюрморт каля акна» (1934), «Зімовая Прага» (1944—46), «Гераічная Прага» (1953), «Летняя Прага» (1953).

СЛА́ВІЯ, ас-Славія, адзін з трох асн. цэнтраў дзяржаўнасці ў Стараж. Русі 8—9 ст. Згадваецца араб., перс. і сярэднеазіяцкімі геаграфамі 9—10 ст. разам з *Артаніяй* і *Куявіяй*. Большасць даследчыкаў лічаць С. паліт. аб'яднанне слав. плямён вакол воз. Ільмень (гл. *Славене*), а яе сталіцу — г. Салаў (Слава) атаясамліваюць са стараж. *Ноўгарадам* або яго папярэднікам. Існуе таксама гіпотэза, што С. была адным з цэнтраў першапачатковай Надняпранскай Русі (Пераяслаў). У некат. раннесярэдневяковых крыніцах С. называюць дзярж. ўтварэнні палабскіх і балт. славян, а таксама Польшчу.

СЛАВУ́К (Слаук) Валерый Пятровіч (н. 7.4.1947, г.п. Коханава Талачынскага р-на Віцебскай вобл.), бел. графік. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1977). З 1997 выкладае ў Бел. АМ. Працуе ў станковай і кніжнай графіцы. Творчай манеры ўласцівы контурнасць выявы, мадэліроўка аб'ёмаў філіграннымі дробнымі штрыхамі, часта гратэскавасць і іранічнае шаржыраванне персанажаў. Для станковых твораў характэрны адыход ад канкрэтыкі сюжэтнага дзеяння, абагульненне вобразнай шматграннасці зместу, падрабязнае адлюстраванне прадметаў побыту і навакольнага асяроддзя: «Белы кот» (1995), «Начны візіт», «Дарога» (абодва 1996), «Аднарог», «Прыцемкі» (абодва 1997), «Запаволены рух», «Эдэм», «Ператварэнне» (усе 1998) і інш. Кніжная графіка вызначаецца абвостраным успрыманнем літ. зместу, эмацыянальным і глыбокім выяўленнем характараў герояў, своеасаблівасцей сюжэтаў: нар. казкі «Удовін сын» (1977—80), «Піліпка-сынок», «Курачка Раба» (абедзве 1983), «Людзей слухай, а свой розум май» (1988), «Алёнка» (1989), «Залаты птах» (1993), казку «Лятучы цмок» У.Ягоўдзіка (1995), кнігі «Касмалёт» М.Ганчарова (1979), «Ад рэчыва да сутнасці» К.Шарыкава (1982), «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Я.Баршчэўскага (1990), «Вясна ўвосень» У.Караткевіча (2000) і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 2001.

Літ.: Баразна М. Р. Беларуская кніжная графіка 1960—1990-х гг. Мн., 2001. *М.Р.Баразна.*

СЛАВЯ́НА-ГРЭ́КА-ЛАЦІ́НСКАЯ АКАДЭ́МІЯ, адна з першых агульнаадук. вышэйшых навуч. устаноў у Расіі. Засн. ў Маскве ў 1687 па ініцыятыве *Сімяона Полацкага*, наз. Эліна-грэч. акадэміяй або Славяна-грэка-лац. вучылішчам. Размяшчалася ў Заіканаспаскім манастыры. Першыя кіраўнікі і выкладчыкі — грэкі-манахі, д-ры Падуанскага ун-та браты Іаанікій і Сафроній Ліхуды. Рыхтавала святароў, перакладчыкаў, рэдактараў кніг, выкладчыкаў. У межах акадэміі ажыццяўляліся рэцэнзаванне

духоўных кніг, выпраўленне слав. перакладу Бібліі, барацьба з ератыкамі і вераадступнікамі. У 17 ст. выкладаліся слав., грэч. і лац. мовы, *«сем вольных мастацтваў»* і багаслоўе. З 18 ст. курс навучання пашырыўся (ням. і франц. мовы, медыцына, фізіка). У 1701 акадэмія перайменавана ў Славяна-лацінскую, у 1775 — у С.-г.-л.а. У 1814 пераўтворана ў Маскоўскую духоўную акадэмію і пераведзена ў Троіца-Сергіеву лаўру. У акадэміі вучыліся многія вядомыя дзеячы рус. культуры 17—18 ст., у т.л. М.В.Ламаносаў, А.Дз.Кантэмір, В.К.Традзьякоўскі, першы рус. д-р медыцыны П.В.Поснікаў і інш.

В.Славук. Іл. да казкі «Лятучы цмок» У.Ягоўдзіка. 1995.

СЛАВЯНАЗНА́ЎСТВА, комплексная навук. дысцыпліна, якая вывучае паходжанне, гісторыю, культуру і мовы слав. народаў як састаўных частак наднацыянальнай слав. этнакульт. супольнасці. Узнікла ў 2-й пал. 18 ст. паралельна з фарміраваннем нац. гістарыяграфіі і філалогіі ў асобных слав. краінах; адначасова ўзнік і тэрмін «С.», або «славістыка». Як вучэнне і навука С. аформілася ў Чэхіі і Славакіі, дзе ля яго вытокаў стаялі І.*Добраўскі*, І.Юнгман (1773—1847), Я.*Колар*, Ф.Чэлакаўскі (1799—1852), Ф.*Палацкі*, П.І.*Шафарык*, твор якога «Славянскія старажытнасці» стаў асновай развіцця С. ў інш. слав. краінах. У Балгарыі С. звязана з імем Паісія Хілендарскага (1722—98), у Сербіі — І.*Раіча* і В.*Караджыча*, у Славеніі — В.*Копітара*. У польскай і бел. гістарыяграфіі значны ўклад у развіццё С. зрабілі Я.*Патоцкі*, С.Б.*Ліндэ*, В.Суравецкі (1769—1827), З.*Даленга-Хадакоўскі*, А.*Міцкевіч*, І.*Лялевель*, В.А.*Мацяёўскі* (4 апошнія вызначылі месца Беларусі ў слав. свеце). Станаўленню С. ў Расіі спрыяла дзейнасць М.В.*Ламаносава*, В.М.*Тацішчава*, М.М.*Карамзіна*, А.Х.*Вастокава*, Ю.І.Вяневіна (1802—39) і інш. У 1-й пал. 19 ст. ўзніклі першыя кафедры С. ва ун-тах Зах. Еўропы — у Парыжы, Вене, Лейпцыгу, Берліне і інш. Вял. значэнне для развіцця С. на Захадзе мела дзейнасць І.Г.*Гердэра*, які разглядаў славянства, па аналогіі з герм. светам, як адзіную паліт. раздробленую вял. нацыю. У 2-й пал. 19 ст. склалася ў агульнапрызнаную навук. дысцыпліну. Цэнтр развіцця С. з гэтага часу перамясціўся ў Расію, дзе яго развіццю спрыялі працы М.П.*Пагодзіна*, В.М.*Бадзянскага*, І.І.*Сразнеўскага*, В.І.Грыгаровіча, Ф.І.*Буслаева*, А.А.*Патабні*, М.Н.Спяранскага, А.А.*Шахматава*, А.І.*Сабалеўскага*, М.К.*Любаўскага* і інш. Побач з развіццём інтэгральнай агульнаслав. праблематыкі ішоў працэс дыферэнцыяцыі навук. кірункаў, праблема суадносін якіх з цэласнай сістэмай С. выклікала палеміку і застаецца дыскусійнай да нашага часу. Некат. гісторыкі трактуюць С. толькі як сукупнасць гуманіт. навук пра асобныя слав. краіны, адмаўляюць існаванне агульнаслав. этнакульт. супольнасці. У сав. перыяд праблемы С. даследавалі Б.Дз.*Грэкаў*, М.П.*Грацыянскі*, М.С.*Грушэўскі*, М.С.*Дзяржавін*, М.М.*Ціхаміраў*, Б.А.*Рыбакоў*, П.М.*Трацякоў*, Ю.У.*Брамлей*, У.Д.Каралюк, В.В.*Сядоў* і інш. Цэнтрам даследаванняў па С. ў Расіі з'яўляецца Ін-т С. і балканістыкі Рас. АН у Маскве. З 1965 выдаецца час. «Славяноведение» (да 1992 «Советское славяноведение»). Праблемы С. даследавалі З.*Неедлы* (Чэхаславакія), У.Геаргіеў (Балгарыя), Т.*Лер-Сплавінскі*, Г.*Лаўмянскі*, І.Чалакоўскі (Польшча); у Зах. Еўропе і ЗША — Г.Шцёкль, М.Фларынскі, Г.У.*Вярнадскі*, Р.Якабсон, Э.*Фром* і інш.

На Беларусі ў 2-й пал. 19 ст. тэматыка С. суправаджала развіццё нац. гуманіт. навук, а заходнярус. школа, ідэйна блізкая да рус. *славянафільства*, разглядала гісторыю і культуру Беларусі ў агульнарас. і агульнаслав. кантэксце. Працы І.І.*Грыгаровіча*, М.В.*Каяловіча*, І.І.*Насовіча*, П.М.*Жуковіча*, А.П.*Сапунова*, М.В.*Доўнар-Запольскага*, Я.Ф.*Карскага*, Е.Р.*Раманава*, П.А.*Бяссонава* і інш. заклалі асновы бел. С. Станаўленне нац. бел. дзяржаўнасці, заснаванне тут універсітэта і Акадэміі навук, а потым і разгалінаванай сістэмы навук. і навуч. устаноў узнялі бел. С. на агульнаеўрап. ўзровень. На Беларусі працавалі вучоныя-славяназнаўцы У.І.*Пічэта*, У.М.*Перцаў*, А.П.П'янкоў, І.В.*Воўк-Левановіч*, А.М.*Ляўданскі* і інш.

У наш час праблемы С. даследуюцца ў БДУ (кафедры тэарэт. і слав. мовазнаўства, замежнай л-ры, слав. л-р, гісторыі паўд. і зах. славян, гісторыі Расіі, гісторыі міжнар. адносін і інш.), Ін-це мовазнаўства Нац. АН Беларусі (аддзел слав. і тэарэт. мовазнаўства), Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі, Гродзенскім ун-це. Сярод прац кафедры тэарэт. і слав. мовазнаўства БДУ: «Славянскія лічэбнікі» (1969), «Лексічная тыпалогія славянскіх моў» (1983), «Палабская мова» (1987), «Эвалюцыя сістэмы часцін мовы ў славянскіх мовах» (1988), «Старославянская мова» (1991) і «Праславянская мова» (1993) А.Я.Супруна, «Фальклорныя элементы ў фразеалогіі сучасных славянскіх моў» К.М.Гюлумянц (1978), «Балгарская мова» Б.Ю.Нормана (1980), «Чэшская мова» Н.В.Івашынай і Б.А.Плотнікава (1985), «Раннія ўсходнеславянскія граматыкі» (1984) і «Славенская мова» (1991) Н.Б.Мячкоўскай, «Сербскахарвацкая мова» Л.В.Лявонавай (1988), «Польская мова» А.К.Кіклевіча, А.А.Кожынавай і І.У.Кур'ян (2000), сумесны зборнік славістаў БДУ і ун-та ў г. Бохум (Германія) «Славяна-германскія моўныя паралелі» (1996), а таксама даследаванні У.Б.Жураўля, А.В.Зінкевіча, А.М.Калюты, А.М.Рудэнкі і інш. Славістычны кірунак у літ.-знаўстве прадстаўлены ў БДУ працамі І.В.Шаблоўскай (праблемы кампаратыўнага вывучэння слав. л-р у манаграфіі «Самай высокай мерай», 1984), І.А.Чароты і М.В.Труса («Югаславянскія літаратуры і культуры», 1999). У Ін-це мовазнаўства Нац. АН Беларусі найб. значныя працы ў галіне С.: «Славяна-германскае лексічнае ўзаемадзеянне пазнейшай пары» В.У.Мартынава (1963), «Сінтаксіс займеннікавых клітык у паўднёваславянскіх мовах», «Энкліза і праклiза ў структуры славянскага сказа» (абедзве 1968), «Тыпалагічныя праблемы балканаславянскага моўнага арэала» (1981), «Арэальная тыпалогія славянскіх моў: Прынцыпы і напрамкі даследавання» (1988) і «Арэальныя аспекты фарміравання славянскіх літаратурных норм» (1993)

Г.А.Цыхуна і інш. У галіне С. працавалі і працуюць: М.П.Антропаў, Г.Ф.Вештарт, Л.Ц.Выгонная, В.Л.Вярэніч, Р.У.Краўчук, І.І.Лучыц-Федарэц, Мартынаў, А.Я.Міхневіч, А.С.Сакалоўская, Цыхун, В.М.Чэкман і інш. У Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі вядуцца даследаванні па матэрыяльнай і духоўнай культуры бел. і інш. слав народаў. Найб. значныя працы: «Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя» Г.А.Барташэвіч (1985), «Беларуская казка ў казачным эпасе славян» (1968), «Беларуска-рускія фальклорныя сувязі», «Узаемадзеянне ўсходнеславянскіх фальклорных традыцый на сучасным этапе» (абедзве 1988) К.П.Кабашнікава, творы Л.М.Салавей і інш. Значным укладам у С. з'явіліся працы М.Г.Булахава «Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў XIX—XX стст. ва ўзаемаадносінах з іншымі славянскімі мовамі» (1958), «Усходнеславянскія моваведы» (т. 1—3, 1976—78). У Гродзенскім ун-це дзейнічае кафедра польскай філалогіі (стваральніца С.П.Мусіенка). Праблемы гіст. С. на Беларусі даследуюць І.В.*Аржахоўскі*, Н.А.Гусакова, Э.М.*Загарульскі*, Р.Р.Лазько, Л.В.Лойка, Д.Б.*Мельцэр*, Л.Л.Міхайлоўская, С.В.Пазняк, А.П.Салькоў, Л.П.Сушкевіч, Н.А.Царук, В.М.Чарапіца, М.Э.Часноўскі, А.А.Яноўскі і інш. Каардынацыйны цэнтр С. на Беларусі — *Славістаў беларускі камітэт*, які ўваходзіць у *Славістаў міжнародны камітэт*. У 1976 ЮНЕСКА стварыла Міжнар. асацыяцыю па вывучэнні і распаўсюджванні слав. культур, у рамках якой працуе яе бел. нац. к-т. У 1982 у Мінску праведзена міжнар. навук. канферэнцыя «Славянскія культуры і сусветны культурны працэс».

Літ.: Советское славяноведение. М., 1963; Очерки истории исторической науки в СССР. Т. 1—5. М., 1955—85; Славяноведение в дореволюционной России: Биобиблиогр. словарь. М., 1979; Супрун А.Е. Введение в славянскую филологию. 2 изд. Мн., 1989; Позняк С.В., Яновский О.А. Преподавание истории славянских стран в Белорусском государственном университете (1921—1997 гг.) // Вісн. Київськ. ун-та. Історія. 1998. Вип. 37.

А.В.Зінкевіч, Я.І.Трашчанок.

СЛАВЯ́НАЎ Мікалай Гаўрылавіч (5.5.1854, с. Нікольскае Ліпецкай вобл., Расія — 17.10.1897), расійскі электратэхнік; адзін са стваральнікаў дугавой зваркі. Скончыў Пецярб. горны ін-т (1877). Працаваў на металург. з-дах Урала, з 1883 на Пермскіх гарматных з-дах (Матавіліха). Упершыню выкарыстаў эл. ток для прамысл. нагрэву, у 1888 распрацаваў спосаб зваркі метал. плаўкім электродам з папярэднім падагрэвам вырабу, выкарыстаў электразварачны генератар, сканструяваў аўтам. рэгулятар даўжыні дугі («электраплавільнік») — правобраз аўтам. зварачных галовак. Прапанаваў выкарыстоўваць флюсы і ферасплавы-раскісляльнікі для павышэння якасці зварных швоў, эл. дугу — для ўшчыльнення метал. адліваак падагрэвам верхняй часткі зліткаў. У працах С. закладзены металург. асновы дугавой электразваркі. Аўтар працы па электразварцы («Электрычная адліўка металаў», 1891).

Літ.: Огиевецкий А.С., Радунский Л.Д. Н.Г.Славянов. М.; Л., 1952.

СЛАВЯНАФІ́ЛЫ, прадстаўнікі аднаго з кірункаў рас. грамадскай і філас. думкі 1840—50-х г., якія выступалі з абгрунтаваннем ідэі асаблівага, адметнага ад зах.-еўрап. шляху гіст. развіцця Расіі. Ідэйна супрацьстаялі *заходнікам*, якія сцвярджалі, што Расія павінна развівацца шляхам засвойвання зах.-еўрап. паліт. сістэмы, сац. ін-таў і эканам. ладу. Філас. канцэпцыю С., якая ўяўляла сабой рэліг.-філас. вучэнне, распрацоўвалі А.С.*Хамякоў*, І.В.*Кірэеўскі*, К.С.*Аксакаў*, Ю.Ф.*Самарын* і інш. У аснове ідэй С. — гістарыясофскае абгрунтаванне самабытнасці Расіі і яе сац.-эканам. ўкладу, абвяшчэнне праваслаўя адзіна сапраўдным хрысціянствам. Паводле С., сапраўдная вера, што прыйшла на Русь з усх. царквы, абумовіла асаблівую гіст. місію рус. народа. С. ідэалізавалі дапятроўскую Русь, якая ўяўлялася ім гарманічным грамадствам без супярэчнасцей і ўнутр. канфліктаў, арган. адзінствам народа і ўлады. Паводле С., Пётр I парушыў гарманічнае развіццё Расіі, у выніку чаго дзяржава прэваліруе над народам, а інтэлігенцыя і дваранства пад уплывам зах.-еўрап. культуры адарваліся ад нар. жыцця. С. заклікалі інтэлігенцыю да збліжэння з народам, вывучэння яго жыцця, традыцый і культуры. Для эстэт. і літ.-крытычных поглядаў С. характэрна крытыка «чыстага мастацтва» і абгрунтаванне неабходнасці ўласнага шляху развіцця рус. маст. культуры. С. лічылі, што маст. творчасць павінна адлюстроўваць абшчыннасць, патрыярхальную ўпарадкаванасць нар. быту, рэлігійнасць рус. чалавека. Ідэі С. паўплывалі на развіццё рус. філас. і рэліг.-містычнай думкі.

І.В.Катляроў.

СЛАВЯНАФІ́ЛЬСТВА, адзін з кірункаў рус. філас. і грамадскай думкі сярэдзіны 19 ст. Гл. *Славянафілы*.

СЛАВЯ́НЕ, найбуйнейшая ў Еўропе група народаў, аб'яднаная блізкасцю моў і агульнасцю паходжання. Размаўляюць на мовах слав. групы (гл. *Славянскія мовы*) *індаеўрапейскіх моў*. Падзяляюцца на 3 групы: усходнія (*беларусы, рускія, украінцы*), заходнія (*палякі, чэхі, славакі*, лужычане) і паўднёвыя (*балгары, сербы, славенцы*, харваты, чарнагорцы, баснійцы-мусульмане, македонцы). Складаюць асн. частку насельніцтва Балгарыі, Беларусі, Босніі і Герцагавіны, Македоніі, Польшчы, Расіі, Славакіі, Славеніі, Украіны, Харватыі, Чэхіі, Югаславіі; жывуць і ў Германіі. Агульная колькасць слав. народаў — каля 300 млн. чал. (сярэдзіна 1990-х г.).

Гісторыю стараж. С. вывучаюць паводле археал., антрапалагічных, лінгвістычных і этнаграфічных даных, звестак стараж.-грэчаскіх, рымскіх і візантыйскіх гісторыкаў (*Пліній* Старэйшы, *Тацыт*, *Пталамей*, *Іардан*, *Пракопій* і інш.), раннесярэдневяковых летапісаў і хронік. Найб. старажытныя гіст. звесткі пра С., вядомых тады пад імем *венедаў*, адносяцца да 1—2 ст. н.э. З сярэдзіны 6 ст. найменне «С.» неаднаразова сустракаецца ў працах Пракопія, Іардана і інш. Этнонім «С.» выводзяць ад «слова» (г. зн. «славяне» — «тыя, хто разумее словы, мову», у адрозненне ад «нямых» — немцаў).

Звесткі моваznаўства, у т.л. гідранімікі, звязваюць стараж. С. з шырокай вобласцю Цэнтр. і Усх. Еўропы, ад Эльбы і Одэра на З, у басейне Віслы, у Верхнім Падняпроўі і да Сярэдняга Падняпроўя на У. Паўн. іх суседзямі былі *германцы* і *балты*, якія разам са С. складалі паўн. групу індаеўрапейскіх плямён; усх. суседзямі — зах.-іранскія плямёны (*скіфы, сарматы*), паўднёвымі — фракійцы і *ілірыйцы*, заходнімі — *кельты*. Пытанне пра найстаражытнейшую «прарадзіму» С. застаецца дыскусійным.

Паводле меркавання многіх археолагаў, стараж. С., таксама як і германцы і балты, былі нашчадкамі жывёлагадоўча-земляробчых плямён *шнуравой керамікі культуры*, што на мяжы 3-га і 2-га тыс. да н.э. з Паўн. Прычарнамор'я і Прыкарпацця рассяліліся па Цэнтр., Паўн. і Усх. Еўропе. У наступныя часы даследчыкі прасочваюць С. сярод носьбітаў некалькіх генетычна звязаных археал. культур, у т.л. *тшцінецкай культуры* (2-я пал. 3-га тыс. да н.э.), пашыранай паміж Віслай і Сярэднім Дняпром, *лужыцкай культуры* (15—4 ст. да н.э.) і *паморскай культуры* (7—2 ст. да н.э.) на тэр. Польшчы, зах. раёнаў Беларусі і Украіны. Некаторыя археолагі лічаць праславянамі носьбітаў *чарналескай культуры* (10—7 ст. да н.э.) у Падняпроўі, *неўраў* і скіфаў-земляробаў (паводле Герадота). Існуе меркаванне пра сувязь са С. *мілаградскай культуры* (7—3 ст. да н.э.) і *зарубінецкай культуры*, якая існавала з канца 1-га тыс. да н.э. на Прыпяці і ў Сярэднім Падняпроўі; яе пераемніцу *кіеўскую культуру* (2—5 ст. н.э.) звязваюць з продкамі ўсх. славян.

У 2—4 ст. н.э. ў выніку руху на Пд германскіх плямён (*готаў, гепідаў*) цэласнасць тэрыторыі С. парушана, што, верагодна, паўплывала на адасабленне заходніх і ўсходніх С. У 3—4 ст. у Сярэднім Падняпроўі і Паўн. Прычарнамор'і жылі плямёны, якія пакінулі *чарняхоўскую культуру*; мяркуецца, што ў яе складзе быў слав. элемент. Бясспрэчна славянскай была *пражская культура*, якая ў 5—7 ст. займала вялізную тэр. паміж Дняпром, Прыпяццю, Эльбай і Дунаем.

У канцы 5 ст., пасля падзення дзяржавы *гунаў*, пачалося прасоўванне С. на Пд (да Дуная, у Паўн.-Зах. Прычарнамор'е) і іх уварванне ў балканскія пра-

вінцыі Візантыйскай імперыі (гл. *Візантыя*). Тады плямёны С. падзяляліся на 2 групы — *антаў* (урываліся на Балканскі п-аў праз нізоўі Дуная, носьбіты *пянькоўскай культуры*) і *склавінаў* (нападалі на візантыйскія правінцыі з Пн і ПнЗ, носьбіты пражскай культуры). У 2-й пал. 1-га тыс. С. занялі Верхняе Падняпроўе і яго паўн. перыферыю, што раней належалі ўсх. балтам і фінаугорскім плямёнам, а таксама землі на ніжняй Эльбе і паўд.-зах. узбярэжжы Балтыйскага мора (палабскія С.) і ператварыліся ў буйнейшую этнічную групу Еўропы. У 3-й чвэрці 1-га тыс. слав. элементы прасочваюцца ў *банцараўскай культуры, калочынскай культуры, доўгіх курганах* і інш. помніках лясной зоны Усх. Еўропы. С. распадаліся на асобныя племянныя групоўкі: ужо ў 6 ст. вядомы *дулебы*, пазней у «Аповесці мінулых гадоў» названы *паляне, севяране, драўляне, улічы, ціверцы, харваты, бужане, валыняне, дрыгавічы, крывічы, радзімічы, вяцічы* і інш.

У выніку рассялення С. іх этнічная і моўная супольнасць паступова разбуралася, што прывяло да ўтварэння 3 слав. груповак — заходняй, усходняй і паўднёвай. З распадам родавага ладу і ўзнікненнем старажытнейшых слав. дзяржаў (*Першае Балгарскае царства*, дзяржава *Сама, Вялікамараўская дзяржава*, Карантанія, *Кіеўская Русь* і інш.) у канцы 1-га тыс. пачалі фарміравацца сярэдневяковыя слав. народнасці: палякі і чэхі, крыху пазней — славакі (зах. С.), славенцы, сербы, харваты і балгары (паўд. С.). Ва ўсх. С. ішоў працэс фарміравання стараж.-рус. народнасці. У наступныя стагоддзі тэр. рассялення С. зведала істотныя змены. Мадзьярскія (венгерскія) плямёны, якія ў канцы 9 ст. прасунуліся ў даліну сярэдняга Дуная, адрэзалі зах. С. ад паўднёвых, пры гэтым частка слав. насельніцтва Панноніі асімілявана венграмі. Тэрыторыя зах. С. скарачалася пад націскам немцаў, якія знішчылі або асімілявалі амаль усіх палабскіх і паморскіх С. (акрамя лужычан і кашубаў); палякі на Пн былі ў значнай меры адрэзаны ад Балтыйскага мора, а на Пд, дзе немцы пранікалі ў Сілезію, апынуліся адмежаванымі ад чэхаў. Немцы занялі і частку чэшскіх зямель. Скарацілася і тэрыторыя паўд. С. Большая іх частка на Пелапанескім п-ве асімілявана грэкамі. Ішоў працэс асіміляцыі аўстрыйцамі карынтыйскіх славенцаў. З 9—10 ст. сярод С. пачало распаўсюджвацца хрысціянства. Браты *Кірыла і Мяфодзій* распрацавалі літургію на слав. мове, азбуку (*глаголіцу*), зрабілі пераклад некаторых рэліг. кніг. У большасці паўд. С. і на Русі зацвердзілася хрысціянства ўсх. абраду, у астатніх С. — заходняга. У 10—11 ст. аформіліся раннефеадальныя манархіі ў палякаў, чэхаў, харватаў, у 12 ст. — у сербаў. У 12—13 ст. этнічнае і палітычнае развіццё С. затарможана і нават перапынена знешнімі фактарамі: мангола-татарскім нашэсцем на Русь, нападамі візантыйцаў і венграў на балканскіх С. (ужо ў 1-й пал. 11 ст. яны падпарадкавалі славакаў, у канцы 11 ст. — харватаў). У 2-й пал. 14 ст. пачалося наступленне туркаў, якія занялі тэрыторыю балгар і сербаў, прымусілі частку сербаў перасяліцца з т. зв. Старой Сербіі на Пн у вобласць Ваяводзіна. Частка балканскіх С. прыняла мусульманства.

У 1348 у Празе заснаваны першы на слав. землях ун-т. Каля 1470 у г. Пльзень (Чэхія) надрукавана 1-я кніга на чэшскай мове. 1-я кніга глагалічнага шрыфту надрукавана каля 1483 (як мяркуюць, у г. Косцін, Харватыя), кірыліцнага шрыфту — у 1491 у Кракаве. Ва ўсх. С. 1-ю кнігу выдаў Ф.*Скарына* ў Празе ў 1517. Заняцце ў 1526 Габсбургамі трона ў Празе вярнула Чэхію пад нямецкі ўплыў, краіна зноў увайшла ў склад «Свяшчэннай Рымскай імперыі».

Ва ўсх. С. у 13 ст. ў выніку мангола-татарскага нашэсця многія паўд. і паўд.-ўсх. вобласці абязлюдзелі. Зах. дзярж. ўтварэнні (княствы) усх. С. з 13—14 ст. аб'яднаны ў складзе *Вялікага княства Літоўскага* (з 1569 у складзе *Рэчы Паспалітай*). У ходзе барацьбы з *Залатой Ардой* і татарскімі ханствамі, што ўзніклі пасля яе распаду, у выніку ўзмацнення *Маскоўскага вялікага княства* з 15 ст. аднавілася засяленне С. паўд.-ўсх. абласцей. У гэты час актывізаваўся і працэс фарміравання ўсх.-слав. народнасцей — беларусаў, рускіх, украінцаў. Пасля заваявання ў 16 ст. Казанскага і Астраханскага ханстваў рускія пашырылі тэрыторыю свайго рассялення, прасунуліся ў Паволжа, Прыуралле і далей — у Сібір. Украінцы пасля вызвалення іх зямель ад татара-манголаў, асабліва пасля падзення *Крымскага ханства* (канец 18 ст.) засялялі прычарнаморскія стэпы і разам з рускімі — стэпавыя і перадгорныя раёны Паўн. Каўказа. Этнічная тэрыторыя беларусаў пашыралася ў паўн.-зах. напрамку за кошт асіміляцыі літоўскага насельніцтва. Ператварэнню Расіі ў магутную еўрапейскую дзяржаву садзейнічала імперская палітыка Пятра I [1682—1725] і Кацярыны II [1762—95]. У выніку заняпаду Рэчы Паспалітай яе землі ў 1772—95 былі захоплены і падзелены паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй. На мяжы 18—19 ст. адзінай незалежнай слав. дзяржавай засталася *Расійская імперыя*. Слав. народы знаходзіліся пад нямецкай (Прусія, Аўстрыя), турэцкай і рас. уладай. Адраджэнне ў 19 ст. нац. самасвядомасці слав. народаў і ідэі іх моўна-культурнай супольнасці, якую прапагандавалі гал. ч. чэхі і славакі (*Я.Колар* і інш.), а таксама ажыўленне нац.-вызв. рухаў на Балканах спрабавала выкарыстаць рас. самадзяржаўе, якое высунула лозунг аб'яднання пад сваёй уладай усіх С. Розныя падыходы ў дачыненні да шляхоў нац. і паліт. вызвалення заняволеных слав. народаў сфарміравалі мноства ідэйна-паліт. кірункаў, якія разам з ідэяй слав. агульнасці (гл. *Панславізм*) прапаноўвалі таксама ідэі лаялізму ў адносінах да дзяржаў-захопнікаў. Пытанне пра слав. вызваленне было ў цэнтры ўвагі Слав. з'езда ў Празе ў 1848. На працягу 19 ст. ў выніку нац. паўстанняў, падтрыманых Расіяй, паліт. незалежнасць здабылі балканскія народы: чарнагорцы (1796, поўны суверэнітэт з 1878), сербы (1804—29, поўны суверэнітэт з 1878), балгары (1878—1906). Нац. прыгнёт і цяжкае эканам. становішча слав. народаў у канцы 19 — пач. 20 ст. выклікалі моцную іх эміграцыю ў інш. краіны Еўропы (напр., у Францыю) і за акіян (гал. ч. у ЗША і Канаду). Агульная колькасць слав. народаў на пач. 20 ст. складала каля 150 млн. чал., у т.л. рускіх — больш за 65 млн., украінцаў — каля 31 млн., беларусаў — каля 7 млн., палякаў — больш за 19 млн., чэхаў — больш за 7 млн., славакаў — больш за 2,5 млн., сербаў і харватаў — больш за 9 млн., балгар — 5,5 млн., славенцаў — 1,5 млн. Асн. маса слав. насельніцтва знаходзілася ў Рас. імперыі — 107,5 млн. чал., у Аўстра-Венгрыі — каля 25 млн. чал., Германіі — больш за 4 млн., у краінах Амерыкі — больш за 3 млн. чал.

Пераломнымі момантамі для С. былі Лют. і Кастр. рэвалюцыі ў Расіі (1917), крах Германскай імперыі і Аўстра-Венгрыі (1918), у выніку якіх незалежнасць здабылі Польшча і народы, што знаходзіліся пад уладай Аўстра-Венгрыі — чэхі, славакі, харваты, славенцы. Утварыліся шматнацыянальныя слав. дзяржавы — Чэхаславакія, Югаславія, а таксама СССР. У 1939 адбылося ўз'яднанне ўсіх бел. і ўкр. зямель, пасля 2-й сусв. вайны — аднаўленне спрадвечнай этнічнай тэрыторыі палякаў і чэхаў. У канцы 20 ст. ў выніку распаду СССР, ЧССР і СФРЮ утварыліся новыя незалежныя слав. дзяржавы, і цяпер усе буйнейшыя слав. народы (у якіх насельніцтва больш за 1 млн. чал.) маюць уласную дзяржаўнасць.

Літ.: Свод древнейших письменных известий о славянах. Т. 1—2. М., 1991—95; Славянские древности: Этнолингвистич. словарь: В 5 т. Т. 1—2. М., 1995—99; Седов В.В. Славяне в древности. М., 1994; Его ж. Славяне в раннем средневековье. М., 1995; Славянское движение XIX—XX вв.: съезды, конгрессы, совещания, манифесты, обращения. М., 1998; Славянская идея: история и современность. М., 1998; Słownik starożytności słowiańskich: Encyklopedyczny zarys kultury Słowian od czasów najdawniejszych do schyłku wieku XII. T. 1—7. Wrocław etc., 1961—82; Łowmiański H. Początki Polski. T. 1—6. Warszawa, 1963—85.

СЛАВЯНІ́ЗМ, с т а р а с л а в я н і з м, ц а р к о ў н а с л а в я н і з м, 1) слова, запазычанае са *старажытнаславянскай мовы* або *царкоўнаславянскай мовы*. Вызначаецца кніжна-пісьмовай ці ўзвышанай стылістычнай афарбоўкай.

С. пранікалі ў *старажытнарускую мову*, калі стараслав. мова ці яе звод (варыянты) шырока выкарыстоўваліся на Русі. Шмат С. у *старабеларускай мове* («блаженства», «бранити», «отвещати»). Фанетычныя прыкметы С.: няпоўнагалоссе (спалучэнні «ра», «ла», «рэ», «ле»

паміж зычнымі, якія суадносяцца з усх.-слав. поўнагалосными «оро», «оло», «ере», «еле» ў адпаведных каранях: «храбры» — «харобры»; спалучэнні «жд», «шч» у адпаведнасці з усх.-слав. «ж» («дж»), «ч» («отвещати» — «отвечати»).

У сучаснай бел. мове (у адрозненне ад рус. і ўкр. моў) колькасць С. вельмі абмежаваная, а іх стылістычная афарбоўка нейтралізавалася («благаславіць», «уваскрасаць», «храм», «шлем»). У асобных маст. творах сустракаюцца стылістычна афарбаваныя *аказіяналізмы* («брацію», «падзвіжнік» у Я.Коласа). Да С. набліжаецца кніжная фразеалогія царкоўнаслав. паходжання, якая ўжываецца пераважна ў публіцыстыцы («святая святых», «плоць ад плоці»). У гутарковай мове стылістычна афарбаваныя С. могуць мець іранічнае адценне. Катэгорыя С. для сучаснай літ. бел. мовы мала характэрная.

2) Слова, запазычанае неслав. мовай з якой-н. слав. мовы. Напр., фінскае kuontalo з усх.-слав. *kodelь, рум. bob з паўд.-слав.* bobъ.

Літ.: Шахматов А.А. Очерк современного русского литературного языка. 4 изд. М., 1941. С. 70—90; Замкова В.В. Славянизм как стилистическая категория в русском литературном языке XVIII в. Л., 1975.

А.Я.Супрун.

СЛАВЯ́НСК, горад у Данецкай вобл. Украіны, на р. Казённы Тарэц. Засн. ў 1676. Каля 130 тыс. ж. (2000). Чыг. вузел. Вытв-сць соды, керамічных вырабаў; з-ды цяжкага машынабудавання, па вытв-сці поліхлорвінілавых плёнак; алоўкавая, мэблевая ф-кі і інш. Здабыча кухоннай солі. ГРЭС. Пед. ін-т. Краязнаўчы музей. Бальнеагразевы курорт.

СЛАВЯ́НСКАЯ НУМАРА́ЦЫЯ, спосаб запісу *лікаў* з дапамогай літар славянскіх алфавітаў. Выкарыстоўвалася ў Расіі як асн. да 18 ст.

Для надання літарам значэнняў лічбаў над імі ставіўся спец. знак — *ціта* (над кожнай літарай запісанага ліку, толькі над першай з іх ці над усім лікам). У лікаў, больших за 10, лічбы запісваліся злева направа ў парадку змяншэння дзесятковых разрадаў (часам пры запісе лікаў ад 11 да 19 адзінкі запісваліся раней 10). Для абазначэння больш высокіх разрадаў (тысяч і больш) ставіліся дадатковыя знакі.

1	2	3	4	5	6	7	8	9
А	В	Г	Д	Є	S	Ζ	Н	Θ
10	20	30	40	50	60	70	80	90
І	К	Л	М	Ν	Ѯ	О	П	Ч
100	200	300	400	500	600	700	800	900
Р	С	Т	Оу	Ф	Х	Ѱ	Ѡ	Ц

а



б

Славянская нумарацыя: а — адпаведнасць паміж лічбамі і літарамі; б — прыклады запісаў лікаў.

«СЛАВЯ́НСКІ БАЗА́Р У ВІЦЕБСКУ», традыцыйны міжнар. фестываль мастацтваў у Віцебску. Засн. ў 1992 як «Славянскі базар» («Славянскі кірмаш»). Арганізатары: мін-вы культуры Беларусі, Расіі, Украіны пры ўдзеле канцэртных і камерц. фірм. З 1998 сучасная назва, праводзіцца пад патранажам Вышэйшага Савета Саюза Расіі і Беларусі. Складаецца з конкурснай часткі (удзельнікі — маладыя выканаўцы краін СНД і Еўропы), а таксама з канцэртаў гасцей, членаў журы. У межах фестывалю праводзяцца нац. дні краінзаснавальніц, фалькл. фэсты з конкурсамі нар. рамёстваў і промыслаў, маст. вернісажы, шматлікія конкурсы, а таксама дзіцячыя фестывалі.

Літ.: Славянский базар в Витебске: Первое десятилетие... Витебск, 2001.

Дз.А.Падбярэзскі.

«СЛАВЯ́НСКІ КІРМА́Ш», міжнар. фестываль мастацтваў, гл. *«Славянскі базар у Віцебску»*.

СЛАВЯ́НСКІЯ МО́ВЫ, група роднасных моў, агульным продкам якіх з'яўляецца *праславянская мова*. Належыць да сям'і *індаеўрапейскіх моў*. Найб. блізкія да С.м. *балтыйскія мовы*. Пашыраны на тэр. Еўропы і Азіі. Носьбітамі С.м. з'яўляюцца каля 350 млн. чалавек. У *славянаназнаўстве* ў залежнасці ад геагр. лакалізацыі, асаблівасцей гіст. развіцця вылучаюць 3 слав. моўныя групы: усх.-слав., зах.-слав. і паўд.-славянскую. Да ўсх.-слав. групы адносяцца: *беларуская мова, руская мова, украінская мова.* Зах.-слав. група аб'ядноўвае *польскую мову, чэшскую мову, славацкую мову, сербалужыцкія мовы* і мёртвую *палабскую мову.* Да паўд.-слав. групы належаць *балгарская мова, македонская мова, сербская мова, харвацкая мова, славенская мова*, мёртвая *стараславянская мова.* Існуюць і т.зв. слав. літ. мікрамовы, якія функцыянуюць на вельмі абмежаванай тэр.: русінская, кашубская, усх.-славацкая, ляшская і інш.

С.м. ўяўляюць сабой вельмі блізкую групу роднасных моў у параўнанні з інш. індаеўрап. мовамі. Гэта праяўляецца ў лексіцы, структуры слова, словаўтваральных сродках, граматыцы, сінтаксісе, семантыцы. Аднак паміж імі існуюць і значныя адрозненні, што абумоўлена іх рознымі шляхамі развіцця ў апошнія паўтары тыс. гадоў. Напр., лексічны склад многіх С.м. адрозніваецца запазычаннямі з інш. неслав. моў: турцызмы ў балг. мове, германізмы ў чэшскай, літуанізмы ў беларускай і г.д. Пісьменнасць у славян існуе на аснове 2 азбук: слав. (гл. *Кірыліца*) і лац. (гл. *Лацінскі алфавіт*). Слав. азбука служыць усім усх. славянам, балгарам, сербам, македонцам. Зах. славяне, харваты, славенцы карыстаюцца лац. алфавітам. Для абазначэння некат. спецыфічных слав. гукаў, якія не маюць у лац. алфавіце адпаведных літар, ужываюцца розныя надрадковыя знакі або спалучэнні літар.

Працэс пераходу праслав. мовы ў самастойныя С.м. гістарычна звязаны з узнікненнем ранніх слав. феад. дзяржаў на значнай тэр. Паўд.-Усх. і Усх. Еўропы ў апошнія стагоддзі 1-га тыс. н.э. У розныя гіст. эпохі колькасць і суадносіны С.м. мяняліся. Так, у наш час мёртвай з'яўляецца стараслав. мова, якая раней мела важнае культ. і культавае значэнне ў жыцці славян, зрабіла істотны ўплыў на фарміраванне і развіццё інш. С.м. (асабліва паўд. і ўсх.). Рус., бел. і ўкр. мовы

Да арт. **«Славянскі базар у Віцебску»**. Дзяржаўны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Беларусі на «Славянскім базары». 1996.

«Славянскі базар у Віцебску». 2000.

існуюць як самастойныя з 14 ст.; яны развіліся з адной *старажытнарускай мовы*, якая раней абслугоўвала патрэбы моўных зносін усіх усх. славян. Знікла палабская мова, на якой размаўляла слав. насельніцтва, што жыло ў басейне р. Лаба (Эльба). У выніку актыўнай германізацыі палабы перайшлі на ням. мову. З другога боку, македонская мова як самаст. літ. мова сфарміравалася ў 20 ст., у 19 ст. былі аб'яднаны ў моўных адносінах сербы і харваты. У канцы 20 ст. адбылося разыходжанне сербскай і харвацкай моў, адзначаны намаганні моваведаў Босніі і Герцагавіны ў стварэнні т.зв. басняцкай (баснійскай) мовы.

Літ.: Кондрашов Н.А. Славянские языки. 2 изд. М., 1962; Нахтигал Р. Славянские языки. М., 1963; Славянские языки. М., 1977; Супрун А.Е. Введение в славянскую филологию. 2 изд. Мн., 1989.

А.В.Зінкевіч.

СЛА́ДКАЎСКІ, Сладкоўскі (Sladkovský) Карал (22.6.1823, Прага — 4.3.1880), чэшскі паліт. дзеяч. Д-р права (1866). Скончыў Пражскі ун-т (1848). У час Рэвалюцыі 1848—49 у Чэхіі адзін з лідэраў радыкальных дэмакратаў і кіраўнікоў *Пражскага паўстання 1848*, удзельнік 1-га Усеслав. з'езда (чэрв. 1848, Прага). Вясной 1849 за ўдзел у падрыхтоўцы новага паўстання арыштаваны і прыгавораны аўстр. ўладамі да пакарання смерцю, заменена на 20 год зняволення. У 1857 памілаваны. З 1862 дэп. чэш. сейма, з 1867 і чл. яго земскага к-та. 22.8.1868 у знак пратэсту супраць аўстра-венг. пагаднення і канстытуцыі 1867 выйшаў з сейма і к-та. У 1875 зноў выбраны ў сейм. Адзін з лідэраў *младачэхаў*, прыхільнік пераўтварэння двухадзінай Аўстра-Венгрыі ў трохадзінную Аўстра-Венгра-Чэшскую манархію. Садзейнічаў стварэнню чэш. нац. тэатра.

СЛА́ІСТА-ДАЖДЖАВЫ́Я ВО́БЛАКІ [міжнар. назва Nimbostratus (Ns)], шэрае воблачнае покрыва змрочнага выгляду са значным верт. развіццём (да выш. 8 км). Здаецца размытым у выніку выпадзення ападкаў. Займае ўсё неба без прасветаў. Складзена з кропель (пры адмоўных т-рах пераахалоджаных) у сумесі са сняжынкамі, у цёплы час года ў ніжняй ч. воблака — буйныя кроплі дажджу. Узнікаюць пераважна пры ўзыходным руху паветра, як найб. магутныя па вертыкалі ч. франтальных воблачных сістэм. З іх выпадае аблажны дождж або снег, зрэдку — ледзяны дождж. Гл. таксама *Воблакі*, *Воблачнасць*.

СЛА́ІСТА-КУЧАВЫ́Я ВО́БЛАКІ [міжнар. назва Stratocumulus (Sc)], воблакі ў выглядзе шэрых або белых (ці адначасова абодвух адценняў) слаёў і град, амаль заўсёды з больш цёмнымі часцінкамі, якія складаюцца з буйных акруглых або валападобных элементаў. Вертык. магутнасць невялікая, размешчаны на выш. да 2 км. Складзены з дробных кропель (пры адмоўных т-рах пераахалоджаных), зрэдку трапляюцца буйныя кроплі дажджу і ядры крупы, сняжынкі і снежныя камякі. Узнікаюць пры хвалевых рухах паветра, асабліва ў слаях інверсій і над падветранымі схіламі ўзвышшаў, пры турбулентным абмене, пры трансфармацыі воблакаў інш. тыпаў, асабліва кучавых і кучава-дажджавых. Часта трапляюцца адначасова з кучавымі воблакамі. Ападкі з большасці гэтых воблакаў не выпадаюць. Гл. таксама *Воблакі*, *Воблачнасць*.

Слаіста-дажджавыя воблакі.

Слаіста-кучавыя воблакі.

СЛА́ДКА Ганна (каля 1872, в. Спудзвілы Бераставіцкага р-на Гродзенскай вобл. — ?), бел. нар. спявачка. Вызначалася цудоўным голасам і фенаменальнай памяццю. У 1892 М.Федароўскі запісаў ад яе больш за 200 бел. нар. песень, а яго памагаты І.Трачык амаль столькі ж мелодый. Запісаныя творы змешчаны ў працы Федароўскага «Люд беларускі» (т. 5—6, 1958—60).

Літ.: Саламевіч Я. Міхал Федароўскі. Мн., 1972. С. 26, 183, 185—186.

І.У.Саламевіч.

СЛА́ІСТАСЦЬ горных парод, будова горных парод у выглядзе наляганя аднаго на другі *слаёў* або пластоў. Уласціва большасці асадкавых і вулканагенна-асадкавых парод, метамарфіч-

ным і магматычным утварэнням. Адрозніваюць С. асадкавых тоўшчаў, унутры слоя (слойчатасць), магматычную першасную і рэліктавую метамарфічных тоўшчаў. С. асадкавых тоўшчаў узнікае пры зменах гідрадынамічных і фіз.-хім. умоў асадканакопжання пад уздзеяннем тэктанічных і кліматычных фактараў; можа ўзнікаць у выніку працэсаў дыягенезу і катагенезу. Утвараецца з гарыз. ці слабанахіленых слаёў парод, якія фарміруюць С. раўнамерную і нераўнамерную, тонкую, дробную, буйную і вельмі буйную. С. унутры слоя (слойчатасць) фарміруецца з тонкіх слайкоў, якія групуюцца ў серыі або пачкі; падзяляецца на гарызантальную, касую, хвалістую і інш. Вылучаюць генетычныя тыпы С.: рачны (рэчышчаў, поймаў, пляжаў), азёрны, азёрна-ледавіковы, часовых вадацёкаў, эолавы, зоны марскіх хваляванняў, цячэнняў і спакойнай седыментацыі. С. магматычная першасная ўласціва інтрузіям, якія крышталізаваліся ў спакойным тэктанічным становішчы і абумоўлена крышталізацыйнай дыферэнцыяцыяй магмы. С. рэшткавая метамарфічных тоўшчаў захоўваецца пры метамарфізацыі слаістых асадкавых і магматычных утварэнняў. С. улічваецца пры рэканструкцыі палеагеаграфічных умоў, стратыграфічным расчляненні, высвятленні ўмоў крышталізацыі інтрузій, пры пошуках карысных выкапняў.

В.І.Ярцаў.

СЛАІСТЫЯ ВО́БЛАКІ [міжнар. назва Stratus (St)], шэры воблачны слой з дастаткова аднароднай асновай, з якога могуць выпадаць імжа, ледзяныя іголкі і снежныя зерні. Часта ніжняя паверхня гэтых воблакаў бывае парванай, касмыкаватай. Звычайна закрываюць усё неба шэрай заслонай, але зрэдку могуць назірацца ў выглядзе парваных воблачных мас. Размешчаны на выш. да 2 км. Складаюцца пераважна з кропель (пры нізкіх т-рах пераахалоджаных). Узнікаюць у выніку ахаладжэння паветра ад подсцільнай паверхні і дадатковага ахаладжэння ў працэсе турбулентнасці; на ўтварэнне ўплывае і турбулентны перанос вадзяной пары знізу і ўвільгатненне паветра ападкамі, якія выпадаюць з воблакаў інш. тыпаў. З найб. магутных і шчыльных С.в. выпадаюць слабыя ападкі. Гл. таксама *Воблакі, Воблачнасць.*

СЛА́ЛАМ (ад нарв. slalåm літ. след, які спускаецца) гарналыжны, спуск на лыжах з гары па звілістай трасе з варотамі. Даўж. трасы для мужчын 500—700 м з перападам вышынь паміж стартам і фінішам 180—220 м, для жанчын — адпаведна да 550 м і 130—180 м. На трасе парамі расстаўляюцца сцяжкі (вароты), праз якія трэба праехаць і не збіць.

Зарадзіўся ў 1920-я г.; спаборніцтвы праходзілі ў Аўстрыі, Італіі, Францыі, Швейцарыі. Чэмпіянаты свету з 1930. У праграме Алімп. гульняў з 1936. Адрозніваюць таксама С. гіганцкі (даўж. трасы больш за 2000 м, перапад вышынь 250—400 м у мужчын і 250—350 м у жанчын) і С. супергіганцкі (розніца вышынь 500—600 м у мужчын і 350—500 м у жанчын). Найб. пашыраны ў Аўстрыі, Германіі, ЗША, Італіі, Францыі, Швейцарыі, Японіі.

С. на водных лыжах (адной або двух) — спаборніцтва водных лыжнікаў на буксіровачным тросе за катэрам па абходзе буёў, размешчаных на вызначанай трасе. С. вяслярны, на байдарках і каноэ — спаборніцтвы ў спуску па рацэ або спец. канале з хуткай плынню і натуральнымі або штучнымі перашкодамі.

А.М.Петрыкаў.

СЛА́МЕТ (Slamet), актыўны дзеючы вулкан у цэнтр. ч. в-ва Ява ў Інданезіі. Выш. 3428 м. Складзены з базальтаў і андэзітаў.

СЛАНЕ́ЧНІК (Helianthus), род кветкавых раслін сям. складанакветных. Каля 70 (паводле інш. звестак да 110) відаў. Пашыраны пераважна ў Паўд. і Паўн. Амерыцы. Культывуюцца С. алейны, або аднагадовы (H. annuus), і *тапінамбур.* У пач. 16 ст. С. завезены ў Еўропу, дзе яго вырошчвалі як дэкар., а пазней агародніннную (насенне) культуру; у Расіі — з канца 17, як алейная — з сярэдзіны 19 ст. На Беларусі вырошчваюць С. алейны як харч., кармавую, меданосную расліну.

Адна- і шматгадовыя травяністыя расліны, радзей паўкусты (выш. ад 20 см да 4—6 м) з простымі ці разгалінаванымі ўверсе сцёблами. Лісце чаргаванае або супраціўнае, зубчастае, апушанае, чараноквае. Суквецці — адзіночныя кошыкі на верхавінках сцябла і яго бакавых галінак, дыяметрам 4—70 см, маюць да 1 тыс. кветак. Шэрагу відаў С. ўласцівы геліятрапізм (асобны выпадак *фотатрапізму*). Плод — сямянка. З насення С. алейнага атрымліваюць *сланечнікавы алей*, макуха і шрот — высокабялковы корм для жывёл, кошыкі суквецціяў перапрацоўваюцца на муку, *разам з зялёнай масай ідуць на сілас.* Харч., лек., тэхн., дэкар., кармавыя, меданосныя расліны.

А.М.Скуратовіч.

СЛАНЕ́ЧНІКАВЫ АЛЕ́Й, раслінны тлусты алей з насення *сланечніку.* Атрымліваюць прасаваннем ці экстрагаваннем арган. растваральнікамі. Залаціста-жоўтая вадкасць, шчыльн. 924 кг/м^3 (15 °С), т-ра застывання ад -16 да -19 °С. Паўвысыхальны алей (гл. *Алеі*). Выкарыстоўваюць як харч. прадукт, для вырабу маянэзаў, як сыравіну ў вытв-сці маргарыну, пакостаў, алкідных смол, мыла.

СЛА́НІКІ, раслінныя згуртаванні з нізкарослых форм дрэў, хмызнякоў і кусцікаў (елка, лістоўніца, кедр, хвоя, бук, рабіна, бяроза, ядловец, верас і інш.), што сцелюцца па зямлі. Развіваюцца ў неспрыяльных умовах для прамаствольнага росту (нізкія т-ры, моцныя вятры, працяглае і глыбокае снегавое покрыва і інш.). Трапляюцца ў гарах, каля верхняй мяжы лесу (часта ўтвараюць цяжкапраходныя зараснікі), у тундры і лесатундры, на марскіх берагах. Працягласць жыцця ў С. большая, чым у прамастаячых дрэвавых раслін (напр., сланікавая форма хвоі звычайнай ў га-

Сланечнік: 1 — агульны выгляд; 2 — спелы кошык; 3 — кошык у разрэзе; 4 — плады сланечніку (а — алейнага; б — прамежкавага; в — грызавога).

рах жыве да 1000 гадоў). Падзяляюцца на сланцы — сцелістыя дрэвы, уласна С. — сцелістыя хмызнякі і сланічкі — сцелістыя кусцікі (верасоўнікі), што разам складаюць асобы морфагенетычны рад *жыццёвых форм* дрэвавых раслін.

СЛАНІ́МСКІ Антон Антонавіч (н. 13.10.1948, в. Салтанаўшчына Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны-эканаміст. Канд. эканам. н. (1988). Скончыў БДУ (1972). З 1982 нам. старшыні Бел. рэсп. праўлення Навук.-эканам. т-ва. З 1988 у Н.-д. эканам. ін-це Мін-ва эканомікі Рэспублікі Беларусь. Адначасова з 1997 адказны сакратар «Беларускага эканамічнага часопіса». Навук. працы па праблемах навуказнаўства, рэгіянальнай эканомікі, развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

Тв.: Региональный научный комплекс: Формирование и организация управления. Мн., 1990; Научный потенциал республики. Мн., 1991 (у сааўт.); Теоретические и методологические основы структурной перестройки экономики Беларуси. Мн., 1996 (у сааўт.); Малый бизнес в СНГ и Восточной Европе: трудности роста (середина — вторая половина 90-х гг.). М., 1997 (у сааўт.); Наука стран Европы на пороге III тысячелетия. Киев, 1999 (у сааўт.); Barriers for the development of small innovative enterprises in transition countries // Utilizing technology transfer to develop small and medium enterprises. Ser. 4. 2001. Vol. 27.

СЛАНІ́МСКІ Зіновій (Хаім Зеліг) Якаўлевіч (31.3.1810, г. Беласток, Польшча — 15.5.1904), матэматык, вынаходнік, папулярызатар прыродазнаўчых ведаў. Самастойна вывучаў матэматыку і астраномію. Вынайшаў (1840) і запатэнтаваў (1845) адну з найб. простых мех. падсумоўвальных машын. Даказаў тэарэму пра ўласцівасці кратных лікаў (тэарэма С.), на аснове якой сканструяваў арыфм. машыну дыскрэтнага лічэння (множанне і дзяленне цэлых лікаў, здабыванне квадратных каранёў). Прапанаваў метад квадруплекснай сувязі (1858; амаль на 20 гадоў раней за Т.Э.*Эдысана*). Аўтар дапаможнікаў і навукова-папулярных прац па матэматыцы, астраноміі, геаметрыі і інш. Дзямідаўская прэмія 1845.

Тв.: Описание нового числительного инструмента, изобретенного Зелигом Слонимским. СПб., 1845; Zur Freiheit bestimmt, Alexander Humboldt — eine hebräische Lebensbeschreibung. Bonn, 1997.

Літ.: Беспамятных Н.Д. Математическое образование в Белоруссии: Ист. очерк. Мн., 1975; Гутер Р.С., Полунов Ю.Л. От абака до компьютера. 2 изд. М., 1981; Апокин И.А., Майстров Л.Е. История вычислительной техники. М., 1990.

М.М.Касцюковіч.

СЛАНІ́МСКІ Міхаіл Леанідавіч (2.8.1897, С.-Пецярбург — 8.10.1972), рускі пісьменнік. Унук З.Я.*Слонімскага*. Вучыўся ў Петраградскім ун-це. Першая кніга — зб. апавяданняў пра 1-ю сусв. вайну «Шосты стралковы» (1922). Раман «Лаўровы» (1926; 2-я рэд. 1953), трылогія «Інжынеры» (1950), «Сябры» (1954), «Равеснікі стагоддзя» (1959) і інш. пра інтэлігенцыю. Аўтар рамана «Сярэдні праспект» (1927), «Праз сем гадоў» (1963), «Кнігі ўспамінаў» (1966) і інш. Ад эфектнага метафарычнага стылю ранніх твораў пазней прыйшоў да лаканічнага рэаліст. стылю.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—4. М., 1969—70; Избранное. Т. 1—2. М., 1980.

Літ.: Луговцов Н. Михаил Слонимский: Критико-биогр. очерк. М., 1966.

СЛАНІ́МСКІ Юрый Іосіфавіч (13.3.1902, С.-Пецярбург — 23.4.1978), расійскі балетазнавец, сцэнарыст, педагог. Ганаровы д-р Парыжскага ун-та танца (1959). Вучыўся ў Школе рус. драмы ў Петраградзе (1918), у Петраградскім ун-це. З 1922 працаваў у Ленінградскім ін-це гісторыі мастацтваў (з перапынкамі), з 1932 выкладаў у Ленінградскім харэагр. вучылішчы. З 1962 праф. Ленінградскай кансерваторыі. На сцэне Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі паставіў балет «Салавей» М.Крошнера (1939, сумесна з А.Ермалаевым). Напісаў сцэнарыі балетаў: «Юнацтва» М.Чулакі, «Сцежкаю грому» К.Караева, «Бераг надзеі» А.Пятрова, «Ікар» С.Слонімскага і інш. Аўтар кніг пра балет «Жызэль» (1926), «Сільфіда» (1927), «Шчаўкунок» (1934), «Майстры балета» (1937), «П.І.Чайкоўскі і балетны тэатр яго часу» (1956), «Драматургія балетнага тэатра XIX ст.» (1977), «Цудоўнае было побач з намі» (выд. 1984), падручніка «Асновы характарнага танца» (1939; у сааўт.).

СЛАНО́ВАСЦЬ, элефантыяз, значнае павелічэнне ч. цела, абумоўленае ацёкам і залішнім утварэннем фібрознай тканкі ў скуры, падскурнай клятчатцы ў выніку працяглага парушэння адтоку *лімфы*. Часцей бывае С. ног, радзей рук, палавых органаў і інш. Падзяляецца на першасную і другасную. Першасная С. бывае прыроджаная і спадчынная, звязана з заганамі развіцця калектарных лімфатычных сасудаў і недастатковасцю іх клапаннага апарату. Другасная С. узнікае ў выніку закупоркі лімфатычных сасудаў, пры сцісканні сасудаў пухлінамі, туберкулёзе і інш. Прыкметы С.: скура паступова дэфармуецца, навісае складкамі, з'яўляюцца трэшчыны, язвы, разрастанні; пашкоджаныя ч. цела дасягаюць значных памераў. Лячэнне тэрапеўт., хірургічнае.

І.М.Семяненя.

СЛАНО́ВАЯ КОСЦЬ, зубное рэчыва (дэнцін) біўняў *слана́ў* (афрыканскага, індыйскага і маманта). Моцны, аднародны, белы з жоўтым адценнем матэрыял, добра паддаецца рэзцы, шліфаванню, пасля пластыфікацыі гнецца. Каштоўная сыравіна для вырабу ўпрыгожанняў і тэхн. мэт. Экспартуецца з Афрыкі і Індыі. Заменнікі С.к. — зубы кашалотаў, нарвалаў, маржоў, таксама раслінная С.к. з насення пальмы фітэлефас.

СЛАНО́ВАЯ ПА́ЛЬМА, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Юбея*.

СЛАНО́ВЫЯ ЧАРАПА́ХІ, гіганцкія чарапахі, найбольш буйныя віды паўзуноў сям. наземных чарапах. 2 віды: уласна С.ч. (Testudo, або Geochelone, elephantopus) з 11 падвідамі, і гіганцкая С.ч. (T., або G., gigantea). Уласна С.ч. жыве на а-вах арх. Галапагас. Гіганцкая С.ч. захавалася на атоле Альдабра ў Інд. ак. Некат. падвіды вынішчаліся з 17 ст. з-за каштоўнага мяса, тлушчу, яек. Віды і падвіды занесены ў Чырв. кнігу МСАП.

Даўж. панцыра да 1,5 м, выш. да 0,6 м, маса ад 100 да 400 кг. Маюць буйныя слупападобныя ногі і доўгую шыю. Адкладваюць да 22 яец масай да 140 г кожнае. Інкубацыйны перыяд 6—7 мес. Расліннаедныя. Жывуць да 100—150 гадоў.

СЛА́НЦАВАЕ МА́СЛА, сланцавая смала, адзін з прадуктаў тэрмічнай перапрацоўкі *гаручых сланцаў*.

СЛАНЦАВА́ТАСЦЬ, уласцівасць горнай пароды расшчапляцца на тонкія пласціны, абумоўлена плоскапаралельным размяшчэннем пародаўтваральных мінералаў. Паводле генезісу адрозніваюць першасную С. (узнікае ў пародах адначасова з *асадканамнажэннем* або *дыягенезам*) і другасную С. (пры метамарфізме парод). Другасная С. бывае мех. (у выніку мех. ўздзеяння на сфарміраваную пароду), дыяфтарычнай (пры рэгрэсіўным мінер. ператварэнні магматычных і метамарфічных парод) і крышталізацыйнай (у выніку лакальнай перакрышталізацыі зыходнай пароды ў новую метамарфічную пароду). Паводле маштабаў праяўлення вылучаюць С. рэгіянальную (на вял. плошчах, напр., пры складкаўтварэнні) і С. мясцовую (напр., пры перамяшчэнні парод уздоўж тэктанічных парушэнняў). С., якая ўзнікла пад мех. уздзеяннем без перакрышталізацыі і пераарыентацыі мінералаў, з утварэннем трэшчын, перпендыкулярных ціску, наз. кліваж (характэрна для *гнейсаў*, *сланцаў* і інш.).

В.І.Ярцаў.

СЛА́НЦАВАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна *паліўнай прамысловасці* па здабычы і перапрацоўцы *гаручых сланцаў*. Уключае атрыманне газу і паліва на быт. і энергет. мэты. Прадукцыя С.п. ідзе таксама на выраб бітуму, ядахімікатаў, талуолу, фарбавальнікаў, сінт. мед. прэпаратаў; попел і шлак выкарыстоўваюць пры вырабе цэменту, сілікатнай і сланцавай цэглы, тэрмаблокаў, пенабетону, аглапарыту, дрэнажных труб і інш.

Узнікла ў 1-й пал. 19 ст. (упершыню ў 1835 у мяст. Аўтун, Францыя; першы сланцахім. камбінат пабудаваны ў 1865 у Аўстраліі). У Расіі выкарыстанне сланцаў пачалося ў 1916 для забеспячэння палівам Петраграда. Сярод краін свету С.п. найб. развіта ў Эстоніі (у 1997 здабыта 14,4 млн. т сланцаў). У многіх краінах не развіваецца ў сувязі з выкарыстаннем больш эфектыўных відаў паліва. Патэнцыяльныя запасы гаручых сланцаў у свеце — 450,4 трлн. т, з іх у ЗША — 431, Бразіліі — 16, Расіі — 2 трлн. т; Канадзе — 410, Італіі — 96, Эстоніі — 18,4, Швецыі — 16 млрд. т. Значныя іх запасы ў Германіі, Францыі, Вялікабрытаніі, Украіне, Кітаі.

На Беларусі гаручыя сланцы ўтвараюць буйны сланцаносны раён у межах Прыпяцкага прагіну пл. 20 тыс. км². Прагнозныя запасы — 11 млрд. т. Найб. разведаныя *Любанскае радовішча гаручых сланцаў* і *Тураўскае радовішча гаручых сланцаў*. *П.І.Рогач.*

СЛА́НЦЫ, метамарфічныя горныя пароды з арыентаваным размяшчэннем састаўных мінералаў, здольныя расколвацца на тонкія пласціны. Для іх характэрна *сланцаватасць*, дробназярністасць, наяўнасць рэліктавых тэкстур і структур, прысутнасць нізкатэмпературных мінералаў. Паводле зыходных парод адрозніваюць ортасланцы (узніклі пры метамарфізме магматычных парод) і парасланцы (з асадкавых парод). Адносна ступені метамарфізму вылучаюць С. глыбокаметамарфізаваныя, або крышт. (*амфіболіты, гнейсы*, слюдзяныя і інш.) і С. слабаметамарфізаваныя (*гліністы сланец*, карбанатныя, крамністыя, вуглістыя, бітумінозныя і інш.). На Беларусі пашыраны гаручыя сланцы ў адкладах верхняга дэвону Прыпяцкага прагіну. *В.І.Ярцаў.*

СЛАНЫ, слановыя (Elephantidae), сямейства млекакормячых атр. хобатных. Вядомы з верхняга міяцэну — ніжняга пліяцэну. 2 роды, у кожным па 1 відзе: афрыканскі С. (Loxodonta africana) з 2 падвідамі (зрэдку даюць як самастойныя віды) — саваннавы, або кустовы, С. (L. a. africana), які жыве пераважна ў аблесенай саванне Усх. і Паўд. Афрыкі; лясны С. (L. a. cyctolis) — пераважна ў дажджавых трапічных лясах Зах. Афрыкі. Індыйскі С. (Elephas maximus) жыве ў лясных абласцях Паўд.-Усх. Азіі. Абодва віды ў Чырв. кнізе МСАП. Да сям. С. належыць *мамант*. На Беларусі знойдзены рэшткі С. паўднёвага (Archidiskodon meridionalis), які быў пашыраны ў раннім антрапагене і выцесніў трацічных *мастадонтаў*. Выш. яго ў плячах больш за 3,7 м. Лічыцца продкам афрыканскіх С. і маманта. Знойдзены рэшткі С. трагантэрыевага (A. trogontherii), які быў пашыраны ў раннім антрапагене. Самы буйны з еўрап. С., у плячах выш. да 4,5 м, біўні даўж. да 5 м. Цела, магчыма, было пакрыта поўсцю. Пераходным відам паміж трагантэрыевым С. і мамантам быў хазарскі мамант, ці С., (Mammuthus chosaricus), рэшткі якога таксама знойдзены на Беларусі. Меў густую поўсць і доўгія біўні, па памерах значна большы за маманта.

Даўж. афрыканскага С. ад канца хобата да канца хваста да 7 м (хобат да 2 м, хвост да 1,5 м). Выш. ў карку да 4,5 м, маса да 7,5 т. Індыйскі С. меншы (выш. цела да 3,2 м, маса да 5 т). Самкі драбнейшыя. Орган дотыку, нюху і хапання — рухомы хобат (зрослыя верхняя губа і нос). Развітыя другія разцы, што ў верхняй сківіцы ўтвараюць біўні і растуць усё жыццё. Скура тоўстая (да 3 см), амаль голая, укрытая рэдкімі шорсткімі валасамі. Расліннаедныя. Жывуць С. 70—80 гадоў, палавaспеласці дасягаюць у 10—20 гадоў, цяжарнасць да 2 гадоў. Нараджаюць 1 дзіцяня масай да 100 кг раз у 4 гады.



Слоны: 1 — афрыканскі; 2 — індыйскі.

СЛА́ЎГАРАД (да 23.5.1945 Прапойск), горад, цэнтр Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл., прыстань на р. Сож пры ўпадзенні ў яе р. Проня. За 70 км ад Магілёва, 58 км ад чыг. ст. Крычаў, вузел аўтадарог на Магілёў, Рагачоў, Чэрыкаў. 8,3 тыс. ж. (2001).

Гарадзішча стараж. С. размешчана на правым беразе р. Сож, каля вусця р. Проня, ва ўрочышчы Замкавая гара (цяпер гарадскі парк). Яго пляцоўка 40 х 95 м, вышыня да 30 м, з зах. боку ўмацавана ровам. У пісьмовых крыніцах С. упершыню ўпамінаецца пад 1136 (летапісная назва Прупой, Пропошеск) у складзе Смаленскага княства. У 13—18 ст. існаваў *Прапойскі замак* як цэнтр абароны сярэдневяковага г. Прапойск. З 14 ст. ў складзе ВКЛ, дзярж. ўладанне. З пач. 16 ст. цэнтр *Прапойскай воласці*, з 1560-х г. цэнтр староства ў Мсціслаўскім ваяв. З 1772 у складзе Рас. імперыі, заштатны горад, потым мястэчка; цэнтр воласці Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., валоданне Галіцыных. У 1787 у Прапойску 2 царквы, 1 касцёл. У канцы 18 ст. на ўскраіне горада створаны парк пейзажнага тыпу. У 1791—93 пабудавана царква Раства Багародзіцы. У пач. 19 ст. належаў Дз.Яншыну, існаваў ін-т шляхетных дзяўчат (да 1828), дзейнічала палатняная мануфактура (засн. ў 1806, 84 рабочыя ў 1809), 2 канатныя ф-кі, кафляны з-д, ветракі, параходная прыстань. У 1886 — 922 ж., 115 двароў; валасное праўленне, школа, бальніца, багадзельня, 2 царквы, сінагога, 4 яўр. малітоўныя дамы, паштовае аддз., гарбарны, кафляны і канатны з-ды, 2 млыны, 2 заезныя дамы, 30 крам. З 26.4.1919 у Гомельскай губ. РСФСР, з 17.7.1924 цэнтр Прапойскага раёна ў БССР (гл. *Слаўгарадскі раён*). З 27.9.1938 гар. пасёлак; 4,7 тыс. ж. (1939). 30.8.1941 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў С. і раёне 2 тыс. чал. Дзейнічала Прапойскае патрыятычнае падполле. Вызвалены 25.11.1943 войскамі 3-й арміі Бел. фронту ў ходзе *Гомельска-Рэчыцкай аперацыі 1943*. З 23.5.1945 горад. У 1959 — 6,6 тыс. ж. У 1962—65 у Быхаўскім р-не. У 1970 — 5,6 тыс. ж.

Працуюць масласырзавод, агародніна-сушыльны і жалезабетонных вырабаў з-ды, камбінат быт. абслугоўвання і інш.; 2 сярэднія школы, Дом культуры, 3 б-кі. Брацкія магілы і могілкі сав. воінаў. Помнікі архітэктуры: *Слаўгарадская царква Раства Багародзіцы*, будынак царкоўнапрыходскай школы (канец 18 ст.), паштовая станцыя (2-я пал. 19 ст.), жылы дом (пач. 20 ст.), *Слаўгарадскі парк*. Гарадзішча стараж. С. Радзіма бел. гісторыка і археографа І.І.*Грыгаровіча*.

СЛА́ЎГАРАДСКАЯ ЦАРКВА́ РАСТВА́ БАГАРО́ДЗІЦЫ, помнік архітэктуры класіцызму ў г. Слаўгарад Магілёўскай вобл. Пабудавана ў 1791—93 паводле праекта арх. М.Львова. У ансамбль з царквой уваходзяць: 2-ярусная званіца з невял. вежачкай у завяршэнні, 2 гасп. пабудовы, будынак царк.-прыходскай школы. З паўд. боку ад царквы — парк, які спускаецца да р. Сож. Царква — цагляны цэнтрычны крыжова-купальны храм. Асн. аб'ём у выглядзе роўнаканцовага крыжа, накрыты 2-схільнымі дахамі з трохвугольнымі франтонамі на тарцах. Дамінанта аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі — сферычны гранёны купал на 8-гранным светлавым барабане, грані якога прарэзаны вял. аконнымі

праёмамі-люнетамі. Паміж канцамі крыжа нізкія аб'ёмы (у плане чвэрць круга), перакрытыя сегментамі купала. Фасады маюць сім. кампазіцыю, вырашаны аднолькава, завершаны развітымі антаблементамі. Уваходны партал вылучаны 2 паўкруглымі калонамі тасканскага ордэра і акном-люнетай. На сценах і скляпеннях захаваліся фрэскавыя размалёўкі ў стылі класіцызму (канец 18 ст.; верагодна, пры ўдзеле маст. У.Баравікоўскага). Захаваліся 57 сюжэтных кампазіцый, найб. цікавыя з іх «Пакуты Хрыста» (у 1-м ярусе), «Цябе Бога хвалім» (на купале), выявы евангелістаў у прасценках барабана. У 1793—94 устаноўлены іканастас (не захаваўся). У 1980-я г. царква адрэстаўрыравана.

Г.А.Лаўрэцкі, А.Ю.Пятросава.

СЛА́ЎГАРАДСКІ ПАРК, помнік садова-паркавага мастацтва ў г. Слаўгарад Магілёўскай вобл. Засн. ў канцы 18 ст. ў сутоку рэк Сож і Проня. Парк пейзажнага тыпу. Абмяжоўваўся лясным масівам; прарэзаны 3 ярамі, паўд. быў мяжой пладовага саду, што прымыкаў да парку. Асн. паркавыя кампазіцыі размяшчаліся абапал сярэдняга вял. яра, на дне якога плацінамі была створана сістэма вадаёмаў са штучнымі каскадамі. Па берагах і плацінах былі дарожкі, раслі групы дрэў і кустоў.

Кампазіцыю парку складалі газон, кветнікі, грот, скульптура, тэхн. збудаванні. У паўн. частцы было гарадзішча, пазней замак, на месцы якога пастаўлены палац (не захаваўся). У парку пераважаюць мясц. ліслевыя пароды дрэў, з экзотаў растуць ясень пенсільванскі (форма аўкубалістая), ясень звычайны (форма драбналістая). С.п. моцна пашкоджаны.

В.Р.Анціпаў.

СЛА́ЎГАРАДСКІ РАЁН. Размешчаны на Пд Магілёўскай вобл. Утвораны 17.7.1924, скасаваны 25.12.1962, адноўлены 6.1.1965. Пл. 1,3 тыс. км². Нас. 17,4 тыс. чал. (2001), гарадскога 47,7%. Сярэдняя шчыльн. 13 чал. на 1 км². Цэнтр — г. *Слаўгарад*. Уключае 83 сельскія нас. пункты, 6 сельсаветаў: Васькавіцкі, Гіжэнскі, Кабінагорскі, Каменкаўскі, Лапаціцкі, Свенскі. Раён моцна пацярпеў ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС: амаль уся тэр. (акрамя крайніх паўн. і паўн.-зах. частак) забруджана радыенуклідамі да 15 Кі/км². Насельніцтва ў выніку масавай міграцыі за 1985—95 паменшала на 8 тыс. чал.

Тэр. раёна ў межах *Аршанска-Магілёўскай раўніны* (крайняя Пн) і *Чачорскай раўніны*. Паверхня раўнінна-ўзгорыстая, 85% яе на выш. 130—170 м, найвыш. пункт 189 м (за 2 км на ПдЗ ад в. Кульшычы). Агульны нахіл паверхні з Пн на Пд. Цэнтр і паўд.-ўсх. ч. раёна заняты далінамі рэк Сож і Проня. Глыб. расчлянення на схілах далін да 10—15 м/км². Карысныя выкапні: торф, даламіты, мел, пясчана-жвіровы матэрыял, буд. пяскі, гліны. Сярэдняя т-ра студз. -7,5 °С, ліп. 18,5 °С. Ападкаў 605 мм за год. Вегетац. перыяд 188 сут. Найб. р. Сож з прытокамі Проня з Растой, Крупкай і Трасліўкай, Пясчанка, Касалянка з Пацэяй, Ельня, Галуба, Каменка, Якушоўка; на З р. Баброўка (прыток р. Дняпро), на Пн р. Хоцінка (прыток р. Раста). Пераважаюць глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (49,9%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (26,7%), поймавыя (алювіяльныя, 10,6%). Пад лесам 37% тэрыторыі, найб. лясныя масівы на ПдУ раёна. Пераважаюць лясы хваёвыя, яловыя, асінавыя; трапляюцца шэраальховыя, дубовыя, чорнааль-ховыя, ясянёвыя, таполевыя і інш. Штучныя насаджэнні — каля 22%, пераважна хваёвыя. Пад балотамі 3% тэр. У межах раёна ахоўны тарфянік Тупніцкае; помнікі прыроды рэсп. значэння — Блакітная крыніца ў в. Кліны і мясц. значэння — лістоўніца каля в. Улукі.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 57,9 тыс. га, з іх асушаных 14,1 тыс. га. На 1.1.2002 у раёне 14 калгасаў, 1 саўгас-камбінат, 3 фермерскія гаспадаркі.

Слаўгарад. Дом культуры.

Слаўгарадская царква Раства Багародзіцы.



СЛАЎКАВІЧЫ 509

Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, вырошчванні збожжавых і кармавых культур, бульбы. Прадпрыемствы буд. матэрыялаў (жалезабетонныя вырабы) і харч. (цэльнамалочныя прадукты, масла, сыр, сушаная садавіна і агародніна, макаронныя і кандытарскія вырабы) прам-сці. Па тэр. раёна праходзяць аўтадарогі Рагачоў—Слаўгарад—Крычаў, Магілёў—Слаўгарад, Слаўгарад—Карма і інш. Суднаходства па р. Сож. У раёне 7 сярэдніх, 10 базавых, 1 пач. школа, дзіцячая школа мастацтваў, Дом дзіцячай творчасці, ПТВ, 12 дашкольных устаноў, 22 клубы, 20 б-к, 1 бальніца, 3 амбулаторыі, 16 фельч.-ак. пунктаў. Помнікі архітэктуры: мемарыяльная капліца і помнік (1908) у гонар перамогі рус. войск над шведскімі ў 1708 каля в. Лясная, парк (пач. 20 ст.) у в. Свенск. Выдаецца газ. «Ленінскае слова».

М.С.Міроненка, Р.Р.Паўлавец.

СЛА́ЎГАРАДСКІ СТАДЫЯ́Л, максімальная стадыя *сожскага зледзянення*. Аддзяляецца *горацкім інтэрстадыялам* ад постмаксімальнага *магілёўскага стадыялу*. За час С.с. сожскае ледавіковае покрыва дасягнула паўн. мяжы Палесся. У яго краявой зоне сфарміраваліся *Белавежская града*, краявыя марэнныя ўтварэнні ў раёнах гарадоў Бяроза, Ганцавічы, Салігорск, Бабруйск, Слаўгарад, г.п. Краснаполле. Адклады С.с. прадстаўлены марэннымі, флювіягляцыяльнымі, озавымі, камавымі і інш. ўтварэннямі. Марэна магутнасцю 50—60 м вызначаецца вял. колькасцю адорвеняў дэвонскіх, мелавых, неагенавых парод. Большасць бел. вучоных сожскае зледзяненне адносяць да стадыі дняпроўскага зледзянення.

СЛА́ЎКАВІЦКА-Я́МІНСКІ КАНА́Л, Слаўкавіцкі канал, Плюсенская канава, меліярацыйны канал у Старадарожскім і Любанскім р-нах Мінскай вобл., на мяжы Любанскага і Глускага р-наў Магілёўскай вобл. і ў Акцябрскім р-не Гомельскай вобл., левы прыток р. Арэса (бас. р. Прыпяць). Даўж. 52 км. Пачынаецца каля паўд. ускраіны в. Рухава Старадарожскага р-на, на Цэнтральнабярэзінскай раўніне, цячэ ў межах Прыпяцкага Палесся. Вусце каля в. Смалоўка Акцябрскага р-на. Шыр. канала ў верхнім цячэнні 2—3 м, у ніжнім 8—10 м. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 2,3 м³/с. Прымае сцёк з некалькіх меліярац. сістэм.

СЛА́ЎКАВІЧЫ, вёска ў Глускім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і аграфірмы «Слаўкавічы». За 27 км на ПдЗ ад г.п. Глуск, 197 км ад Магілёва, 27 км ад чыг. ст. Рабкор. 460 ж., 188 двароў (2001). Лясніцтва, піларама. Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік у гонар Глускіх падп.

райкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ, рэдакцыі газ. «Сацыялістычная вёска».

СЛАЎКО́ВІЧ Даір Фёдаравіч (н. 21.9.1932, Мінск), бел. пісьменнік. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1960). З 1954 бібліятэкар, у 1962—77 заг. Уздзенскай раённай дзіцячай б-кі. Друкуецца з 1946. Піша пераважна для дзяцей і юнацтва пра гераізм народа ў вайну, вёску, маладых рабочых і інш. Аўтар аповесцей «Сцежкаю мужных» (1971), «Клуб вясёлых чамучак» (1973), «Алесік едзе ў Красабор» (1981), дакумент. аповесці «Свежыя ветры над Дворышчамі» (1982), зб-каў апавяданняў «Каласавічок» (1969), аповесцей і апавяд. «Пачым фунт ліха?» (1975), «Алея невядомага салдата» (1981), «Гвардзейскі знак» (1982), нарысаў «Бібліятэкар» (1983), зб. гумару і сатыры «Фірменны сродак» (1976), п'ес «Крутадух» (1980), «Беражыце мужчын» (1984), «Даеш хуткасны!» (1985) і інш. На бел. мову пераклаў казку В.Гаўфа «Маленькі Мук».

Тв.: Федоскины каникулы. М., 1980; «Я вернусь, мама!..» Мн., 1982; Красобор. Мн., 1988.

СЛАЎКО́Ў Уладзімір Іванавіч (9.5.1926, г. Курск, Расія — 1995), бел. акцёр. Засл. арт. Беларусі (1967). Працаваў у розных тэатрах краіны. У 1964—69 у Гомельскім абл. драм. т-ры. Акцёр гераіка-драм. плана. Творчасці ўласцівы яркі знешні малюнак ролі, сац. завостранасць, рамантычная прыўзнятасць. Найб. значныя ролі ў Гомельскім т-ры: Яраш («Сэрца на далоні» паводле І.Шамякіна), Торчыкаў («Заглянуць у калодзеж» Я.Волчака), Прохар Громаў («Угрум-рака» паводле В.Шышкова), Еўдакімаў («104 старонкі пра каханне» Э.Радзінскага), Раман Кошкін («Любоў Яравая» К.Транёва), Чарлз Касл («Зорка Галівуда» К.Одэтса).

СЛА́ЎНАЕ, пасёлак у Талачынскім р-не Віцебскай вобл.; чыг. ст. на лініі Мінск—Орша. Цэнтр сельсавета. За 22 км на ПдЗ ад г. Талачын, 129 км ад Віцебска. 419 ж., 197 двароў (2001).

Вядома як вёска Паўлавіцкай вол. Магілёўскага пав., якая ў 2-й пал. 19 ст. з пабудовай чыг. Орша—Барысаў стала чыг. станцыяй. З 1924 у Талачынскім р-не Аршанскай акр. (да 1930), з 1938 Віцебскай вобл. З ліп. 1941 да 28.6.1944 акупіравана ням. фашыстамі. 28.8.1942 на чыг. ст. С. партызаны правялі *Слаўненскую аперацыю 1942*.

Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Помнік ахвярам фашызму.

«СЛА́ЎНАЯ РЭВАЛЮ́ЦЫЯ», прынятая ў гіст. л-ры назва бяскроўнага дзярж. перавароту 1688—89 у Англіі (звяржэнне караля *Якава II* Сцюарта, абвяшчэнне каралём *Вільгельма III Аранскага* пры абмежаванні каралеўскай улады), які канчаткова адхіліў *абсалютызм* як форму праўлення і ўсталяваў у краіне канстытуцыйную манархію. Гл. *Англійскія рэвалюцыі 17 стагоддзя*.

СЛА́ЎНЕНСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1942, бой партызан з ням. фашыстамі па разгроме гарнізона і чыг. ст. Слаўнае Талачынскага р-на Віцебскай вобл. на лініі Мінск—Орша 28 жн. ў Вял. Айч. вайну. Станцыя была важным пунктам для забеспячэння акупац. войск і хуткага перакіду іх да фронту. Ахоўны гарнізон (каля 120 гітлераўцаў) быў узброены мінамётам, станковым і 10—13 ручнымі кулямётамі, аўтаматамі, умацаваны акопамі, меў каля 10 пастоў аховы. Аперацыю праводзілі атрады С.Г.*Жуніна* (кіраўнік), Дз.А.Кулікова, Г.С.Місніка 8-й Круглянскай партыз. брыгады. У ноч на 28 жн. партызаны падарвалі масты і чыг. палатно з З і У ад станцыі і ў выніку 3-гадзіннага бою зруйнавалі будынкі станцыі, складоў з харчаваннем і фуражом, эшалоны з тэхнікай і інш., падарвалі і знялі рэйкі на працягу 3 км. У выніку С.а., якая адбылася ў самы крытычны момант *Сталінградскай бітвы* рух на чыгунцы ням. эшалонаў быў прыпынены на некалькі сутак. Гітлераўцы 2 вер. правялі аперацыю помсты: расстралялі 100 жыхароў, гал. чынам жанчын, дзяцей, старых, іх дамы спалілі.

Літ.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990. С. 564.

М.У.Філімоненкаў.

СЛА́ЎСКІ (Slawski) Францішак (н. 13.5.1916, г. Капычынцы Гусяцінскага р-на Цярнопальскай вобл., Украіна), польскі мовазнавец. Чл. Польскай АН (з 1969), Польскай АН у Кракаве (з 1989). Д-р філал. н. (1948). Скончыў Ягелонскі ун-т у Кракаве (1938), з 1956 праф. у ім. З 1969 дырэктар Ін-та слав. філалогіі Ягелонскага ун-та. Даследаванні ў галіне паўд.-слав. філалогіі (балгарыстыкі), праслав. мовы. Аўтар «Граматыкі балгарскай мовы» (1953), «Этымалагічнага слоўніка польскай мовы» (т. 1—25, 1952—82, выданне працягваецца), аўтар і гал. рэдактар «Праславянскага слоўніка» (т. 1—7, 1974—95, выданне працягваецца).

Літ.: Современные зарубежные лингвисты: Биобиблиогр. справ. Ч. 3. М., 1989.

А.Я.Міхневіч.

СЛАШЧО́Ў Якаў Аляксандравіч (24.12.1885, С.-Пецярбург — 11.1.1929), расійскі ваенны дзеяч. Ген.-лейт. (1920). Скончыў Акадэмію Генштаба (1911). Удзельнік 1-й сусв. вайны 1914—18. У грамадз. вайну 1918—20 у добраахвотніцкай арміі А.І.*Дзянікіна* камандаваў брыгадай, Чэчэнскай коннай дывізіяй, дзейнічаў супраць войск Н.І.Махно. Са снеж. 1919 камандзір 2-га армейскага корпуса, кіраваў абаронай Крыма (студз.—крас. 1920). У жн. 1920 з-за рознагалоссяў з П.М.*Урангелем* зняты з пасады камандзіра корпуса. Пасля эвакуацыі ў Турцыю белагвардзейскіх войск выступіў у друку супраць Урангеля, паводле загаду якога асуджаны і разжалаваны ў радавыя. Увосень 1921 з дазволу сав. ўрада з групай афіцэраў вярнуўся ў Сав. Расію, амністіраваны. Служыў у Чырв. арміі. Правобраз генерала Хлудава ў п'есе М.Булгакава «Бег».

Тв.: Белый Крым, 1920: Мемуары и док. М., 1990.

СЛАЯВІ́НА, т а л о м, вегетатыўнае цела водарасцей, слізевікоў, грыбоў, лішайнікаў, некат. мохападобных, якое не дыферэнцыравана на органы (сцябло, лісце, корань) і не мае сапраўдных тканак. У ніжэйшых раслін (водарасці) бывае ў выглядзе рухомай або нерухомай клеткі ў абалонцы. Калоніі з 4 і болей (да 60 тыс.) клетак фарміруюць скопішча простых ці разгалінаваных нітак, пласцінак або складаных і марфалагічна дыферэнцыраваных утварэнняў, якія нагадваюць вышэйшыя расліны (бурыя, чырвоныя, харавыя водарасці). У слізевікоў С. маюць выгляд слізістай, без абалонкі, масы ці адзінкавых міксамёб. У грыбоў вар'іруюць ад аднаклетачнага да добра развітога септаванага міцэлію, у лішайнікаў — ад мала развітых коркавых да ліставатых і кусцістых форм. У вышэйшых споравых раслін у выглядзе тыпавых С. развіваюцца зарасткі. Эвалюцыя С. ішла ад простых форм — аднаклетачных жгуцікавых ці амёбаідальных клетак — праз ніткаватыя або пласціністыя формы і да складана дыферэнцыраваных.

СУПРАЦОЎНІКІ ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ», ЯКІЯ ПРЫМАЛІ ЎДЗЕЛ У ПАДРЫХТОЎЦЫ І ВЫДАННІ 14-га ТОМА БЕЛАРУСКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ

Галоўная рэдакцыя

Галоўны рэдактар — Г.П.Пашкоў; намеснік галоўнага рэдактара Т.Я.Буракова; намеснік галоўнага рэдактара Г.А.Фатыхава; намеснік галоўнага рэдактара — адказны сакратар А.К.Фядосаў.

Навукова-галіновыя і кантрольныя рэдакцыі

Рэдакцыя гісторыі Беларусі

Заг. рэдакцыі — кандыдат гістарычных навук Л.У.Языковіч; вядучыя навуковыя рэдактары В.В.Гусева, кандыдат гістарычных навук В.С.Паздняковў, А.В.Скараход; навуковыя рэдактары В.В.Грынявецкі, М.І.Рэменіца, кандыдат гістарычных навук Т.С.Скрыпчанка; рэдактар І.В.Лабанок.

Рэдакцыя ўсеагульнай гісторыі

Заг. рэдакцыі — Ю.В.Бажэнаў; вядучы навуковы рэдактар М.Г.Нікіцін; навуковыя рэдактары кандыдат гістарычных навук В.У.Адзярыха, Н.А.Дзянісава, У.Я.Калаткоў.

«Ваенная справа»: кіраўнік групы — палкоўнік запасу, кандыдат філасофскіх навук Р.Ч.Лянькевіч; вядучы навуковы рэдактар падпалкоўнік запасу В.А.Юшкевіч.

Рэдакцыя філасофіі, эканомікі і права

Заг. рэдакцыі — кандыдат філасофскіх навук С.Ф.Дубянецкі; вядучыя навуковыя рэдактары Т.М.Грынько, В.В.Краснова, Г.А.Маслыка; навуковыя рэдактары А.М.Гарбаценкаў, Н.Г.Кісялёва.

Рэдакцыя літаратуры і мастацтва

Заг. рэдакцыі — Л.В.Календа; вядучыя навуковыя рэдактары Г.М.Малей, Т.Р.Мартыненка, Т.В.Пешына, кандыдат філалагічных навук І.У.Саламевіч, А.В.Спрынчан; навуковыя рэдактары Н.В.Грэская, Т.В.Чарнякова, І.Л.Чэбан; рэдактар Н.В.Мароз.

Рэдакцыя біялогіі, медыцыны і сельскай гаспадаркі

Заг. рэдакцыі — кандыдат біялагічных навук Л.В.Кірыленка; вядучыя навуковыя рэдактары кандыдаты біялагічных навук С.С.Ермакова, А.М.Петрыкаў, вядучы навуковы рэдактар Т.І.Жукоўская; навуковыя рэдактары В.І.Кіцікаў, В.Л.Рэут.

Рэдакцыя геаграфічных навук

Заг. рэдакцыі — кандыдат гістарычных навук В.П.Кісель; вядучыя навуковыя рэдактары І.Я.Афнагель, Л.В.Лоўчая; навуковыя рэдактары Ю.В.Бярэзіна, кандыдат геолага-мінералагічных навук Р.Р.Паўлавец.

Рэдакцыя фізіка-матэматычных і тэхнічных навук

Заг. рэдакцыі — кандыдат фізіка-матэматычных навук А.І.Болсун; вядучыя навуковыя рэдактары П.С.Габец, У.М.Сацута, А.П.Чарнякова, Л.М.Шахлевіч; навуковы рэдактар В.З.Анісовіч.

Рэдакцыя навуковага і літаратурнага кантролю

Заг. рэдакцыі — кандыдат гістарычных навук І.П.Хаўратовіч; вядучыя навуковыя рэдактары В.В.Гетаў, І.У.Косціна, Н.К.Мазоўка, М.А.Маўзон, Т.І.Нішт, С.У.Пешын, М.В.Пятроўская, Е.П.Фешчанка; навуковыя рэдактары Т.У.Люковіч, А.А.Мааль.

Рэдакцыя мастацка-тэхнічнага афармлення выданняў

Заг. рэдакцыі — У.М.Жук; вядучыя мастацкія рэдактары В.Г.Загародні, В.У.Мінько; мастацкія рэдактары І.В.Каранкевіч, Т.В.Шабунька; навуковы рэдактар В.М.Вераценнікава.

Група картаграфіі: вядучы навуковы рэдактар Г.Р.Шыкунова; навуковы рэдактар В.Ф.Надзененка.

Рэдакцыя аналізу і каардынацыі ўнутрывыдавецкай дзейнасці

Заг. рэдакцыі — Л.М.Шастакова; вядучы навуковы рэдактар М.У.Маркевіч; навуковы рэдактар Г.Т.Глушчанка; машыністкі Г.Л.Анісімава, Т.М.Саленік, Л.І.Шыбаева.

Група тэхнічных рэдактараў: М.І.Грыневіч, Н.М.Шэвель.

Рэдакцыя фотаздымак і фотаілюстрацый

Заг. рэдакцыі — Г.М.Бажанкоў; фотакарэспандэнты А.П.Дрыбас, В.У.Харчанка; інжынер-тэхнолаг С.А.Жукавень.

Рэдакцыя камп'ютэрнай падрыхтоўкі рукапісаў

Заг. рэдакцыі — С.А.Макаёнак; інжынеры І.І.Драздова, С.А.Стралкоўская; ст. аператары Р.У.Дзявочка, Н.М.Зубкевіч, Н.У.Мітраховіч, І.А.Навіцкая, Н.А.Стасевіч.

Вытворчы аддзел

Заг. аддзела — Т.М.Грыцышын; інжынер-тэхнолаг Ю.В.Мельнік.

Участак размнажальнай тэхнікі: Я.М.Кузьміна, Ф.А.Юркевіч.

Карэктарскі аддзел

Заг. аддзела — В.М.Чудакова; ст. карэктары Ж.С.Берасневіч, Л.А.Варабей, Т.П.Гілевіч, А.І.Клімовіч, С.М.Красная; карэктар В.А.Кульбіцкая.

Навуковая бібліятэка

Заг. бібліятэкі — Г.А.Краўчанка.

Агульны аддзел

Заг. аддзела — ст. інспектар па кадрах Т.А.Кароткіна; спецыялісты І.В.Бурко, К.А.Каптурава.

Аддзел бухгалтарскага ўліку

Галоўны бухгалтар — В.І.Герыловіч; намеснік галоўнага бухгалтара С.М.Яфімчык; вядучыя бухгалтары Т.Р.Аўтуховіч, В.П.Дабрагост, Л.Я.Пілецкая; бухгалтары І.В.Грыгор'ева, І.М.Жылінская.

Планава-эканамічны аддзел

Вядучы эканаміст Т.І.Лук'янава; эканаміст І.А.Азаранка.

Аддзел рэалізацыі і маркетынгу

Заг. аддзела — В.А.Рабкоў; вядучыя спецыялісты С.А.Акружко, І.Л.Мірон; спецыялісты В.Г.Бехціна, М.Ф.Пачэпка.

Гаспадарчы аддзел

Заг. аддзела — І.А.Шор.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 14: Рэле — Слаявіна / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. — Мн.: БелЭн, 2002. — 512 с.: іл.

Б 43

ISBN 985-11-0238-5 (т.14)
ISBN 985-11-0035-8

УДК 03(476)
ББК 92(4Беи)

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ТОМ 14

РЭЛЕ — СЛАЯВІНА

У томе змешчаны 769 ілюстрацый, у т.л. 187 партрэтаў, 59 карт

Мастацкае афармленне *Э.Э.Жакевіча, А.М.Хількевіча*

Мастацкія рэдактары: *В.Г.Загародні, І.В.Каранкевіч, В.У.Мінько, Т.В.Шабунька*

Тэхнічныя рэдактары: *М.І.Грыневіч, Н.М.Шэвель*

Карэктары: *Ж.С.Берасневіч, Л.А.Варабей, Т.П.Гілевіч, А.І.Клімовіч, С.М.Красная, В.А.Кульбіцкая, В.М.Чудакова*

Падпісана да друку 19.04.2002. Фармат 84×108 $^{1}/_{16}$. Гарнітура Таймс. Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 53,76. Ум. фарб.-адб. 215,88. Ул.-выд. арк. 96,4. Тыраж 10 000 экз. Заказ 321.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 10 ад 10.11.2000. Рэспубліка Беларусь. 220072, Мінск, Акадэмічная, 15а.

Надрукавана з арыгінала-макета на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Мінская фабрыка каляровага друку». Рэспубліка Беларусь. 220024, Мінск, Каржанеўскага, 20.

ISBN 985-11-0035-8